ЕЖЫ ГЖЫБОЎСКІ

Беларуская меншасць у Латвійскай Рэспубліцы (1918–1940 гг.)



WYDAWNICTWA UNIWERSYTETU WARSZAWSKIEGO
WUW

Беларуская меншасць у Латвійскай Рэспубліцы (1918–1940 гг.)

ЕЖЫ ГЖЫБОЎСКІ

Беларуская меншасць у Латвійскай Рэспубліцы (1918–1940 гг.)

WYDAWNICTWA UNIWERSYTETU WARSZAWSKIEGO
WUW

Рэцэнзенты
Юры Гардзееў / Jerzy Gordziejew
Дангірас Мачуліс / Dangiras Mačiulis

Вядучы рэдактар
Якуб Азімэк / Jakub Ozimek

Рэдагаванне, карэктура і указальнікі
Андрэй Скурко

Праект вокладкі
Анна Гагалевска / Anna Gogolewska

Фота на вокладцы
Панарама Рыгі; *Valerie2000 / Shutterstock*

Вёрстка
Дарыюш Гурскі / Dariusz Górski

Выдадзена дзякуючы фінансавай падтрымцы Варшаўскага ўніверсітэта

Апублікавана на ўмовах ліцэнзіі Creative Commons Attribution 4.0 PL
(CC BY 4.0 PL) (поўны тэкст шаблона даступны на: https://creativecommons.org/licenses/by/4.0/legalcode.pl).

Ежы Гжыбоўскі / Jerzy Grzybowski, Uniwersytet Warszawski,
ORCID 0000-0002-7359-487X

ISBN 978-83-235-7108-7
ISBN 978-83-235-7110-0 (pdf online)
ISBN 978-83-235-7109-4 (e-pub)

Выдавец
Wydawnictwa Uniwersytetu Warszawskiego
02-678 Warszawa, ul. Smyczkowa 5/7
wuw@uw.edu.pl
www.wuw.pl

1-е выданне, Варшава 2025

Змест

Уступ 7

РАЗДЗЕЛ І. Перыяд змагання за незалежнасць Латвіі і Беларусі (1918–1921) 21

Беларусы ў Латвіі да пачатку XX стагоддзя: генезіс і ідэнтычнасць . . 21
Пачаткі беларускага руху ў Латвіі (да сярэдзіны 1919 г.) 36
Дзейнасць Беларускай Народнай Рэспублікі на тэрыторыі Латвіі (сярэдзіна 1919 – пачатак 1921 гг.) 41
Перадумовы арганізацыі і дзейнасці 41
Вайскова-дыпламатычная місія БНР у Балтыі 44
Консульства БНР у Рызе 67
Грамадскія арганізацыі дыяспары 83
Завяршальны этап і ліквідацыя органаў БНР у Латвіі 88

РАЗДЗЕЛ ІІ. Ад уздыму да заняпаду. Першы этап беларускай нацыянальна-культурнай аўтаноміі ў Латвіі (1921–1925) 99

Беларусы ў Латвійскай Рэспубліцы: статыстыка, размяшчэнне, дэмаграфічная і сацыяльна-эканамічная характарыстыка 99
Стаўленне латвійскіх улад і палітычнай эліты да беларускай меншасці 127
Стварэнне і дзейнасць першых беларускіх культурна-асветных таварыстваў 139
Беларуская школьная справа: арганізацыя і дзейнасць 152
Сацыяльна-палітычныя ўмовы існавання беларускай школьнай справы 152
Фарміраванне сеткі беларускіх школ 154

Беларускі школьны аддзел і інспектар беларускіх школ 179
Настаўніцкія курсы 187
Пачатковыя школы 199
Сярэднія школы 247
Унутраны канфлікт у асяроддзі беларускага актыву Латвіі 279
Беларускі працэс: прычыны, ход, наступствы (1924–1925 гг.) 291

РАЗДЗЕЛ III. Ад рэактывацыі да ліквідацыі. Другі этап культурна-асветнай аўтаноміі (1925–1934) 330

Культурна-асветныя арганізацыі 330
Кааператыўная дзейнасць 345
Тэатр і музыка 351
Краязнаўчая і навуковая дзейнасць 386
Моладзевы і студэнцкі рух 401
Прэса і кнігавыданне 426
Перыядычныя выданні 426
Кнігавыдавецкая дзейнасць 459
Адукацыя 473
Беларускі школьны аддзел і інспектар беларускіх школ 473
Рыжскія дзяржаўныя беларускія настаўніцкія курсы 490
Колькасць і агульная характарыстыка беларускіх школ 501
Пачатковыя школы 524
Сярэднія школы 559

РАЗДЗЕЛ IV. У свеце палітыкі і міжнацыянальных адносін 613

Латвійскія беларусы і Савецкая Беларусь 613
Кантакты з суайчыннікамі па-за межамі БССР 653
Палітычная дзейнасць 691
Узаемадачыненні з іншымі нацыянальнымі меншасцямі 760
Беларуска-польскія адносіны 761
Беларуска-рускія адносіны 799

РАЗДЗЕЛ V. Пад аўтарытарным кіраваннем (1934–1940) 843

Травеньскі пераварот 1934 года і яго ўплыў на становішча беларускай меншасці 843
Колькасныя змены беларускай меншасці ў Латвіі пасля 1934 г. 870
Актывізацыя беларускага руху напярэдадні і на першым этапе II сусветнай вайны 883

Заканчэнне 901
Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры 907
Указальнік імёнаў 920
Указальнік геаграфічных назваў 934

Уступ

Праблемы нацыянальных меншасцей і міжнацыянальных адносін не перастаюць цікавіць як навукоўцаў, так і палітыкаў. Досвед XX і XXI стагоддзяў паказвае, што нацыянальныя справы моцна ўплываюць на працэс інтэграцыі грамадства і нацыянальную бяспеку. У многіх месцах Еўропы і свету існуюць памежжы, дзе на штодзённым узроўні адбываюцца кантакты паміж прадстаўнікамі розных культур і народаў. Гісторыя даводзіць, што дадзеная з'ява мае свае станоўчыя і адмоўныя бакі. З аднаго боку, шматнацыянальнасць дазваляе грамадству пераадольваць стэрэатыпы і спрыяе ўзаемнаму культурнаму ўзбагачэнню жыхароў памежжа. З іншага боку, часамі гэта стварае канфліктагенныя сітуацыі і можа пагражаць тэрытарыяльнай цэласнасці шматнацыянальнай дзяржавы. Прыкладам з'яўляецца Цэнтральна-Усходняя Еўропа ў міжваенны час. Адным з галоўных вынікаў I сусветнай вайны быў распад у Еўропе шматнацыянальных імперый і стварэнне на іх месцы нацыянальных дзяржаў. Аднак тыя змены на палітычнай мапе канчатктова не вырашылі нацыянальнае пытанне. Большасць новых дзяржаў былі шматнацыяльныя. У выніку адным з галоўных выклікаў для маладых краін стала пытанне, звязанае з прысутнасцю на іх тэрыторыі значнай колькасці прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей, некаторыя з якіх мелі памкненні стварыць уласную дзяржаву. Яскравым прыкладам міжваеннай нацыянальнай мазаікі была Латвійская Рэспубліка. Маладая латвійская дзяржава, якая з'явілася на мапе ў 1918 г., належала да краін са стракатым нацыянальным складам. Значную частку насельніцтва складалі нелатышы, большасць з якіх з'яўлялася аўтахтонамі. Да ліку апошніх належыць залічыць беларусаў, продкі якіх спакон вякоў прысутнічалі на латвійскім этнакультурным краявідзе.

Мэтай дадзенай манаграфіі з'яўляецца ўсебаковы разгляд гісторыі беларусаў у Латвіі ад моманту абвяшчэння незалежнай латвійскай дзяржавы да пачатку II сусветнай вайны. Выбар храналагічных межаў даследавання абумоўлены аб'ектыўнымі прычынамі. Гэтыя часовыя рамкі дазваляюць прасачыць беларускую прысутнасць на латвійскай зямлі на фоне лёсавызначальных і драматычных падзей яе гісторыі: змагання за незалежнасць, будавання дэмакратычнай дзяржавы і ўсталявання аўтарытарнага рэжыму. Таксама ў разгляданы час у Латвіі назіралася значная нацыянальна-культурная і грамадская дзейнасць беларусаў. Да 1918 г. беларусы ў Латвіі не праяўлялі актыўнасці. А пазней, пасля 1940 г., беларускае жыццё ў краіне адбывалася ў іншых умовах: пад савецкай і нямецкай акупацыяй.

Праблему беларускай меншасці ў Латвіі ў 1918–1940 гг. належыць паказаць у кантэксце грамадска-палітычных, дэмаграфічных, нацыянальных і міжнародных падзей, якія тады адбываліся ў краіне і вакол яе. У кнізе будуць прааналізаваныя наступныя аспекты:

- сацыяльна-палітычныя і культурныя ўмовы фарміравання беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці ў Латвіі;
- працэс фарміравання беларускага нацыянальнага руху ў краіне;
- змены колькаснага складу беларускага насельніцтва на фоне агульнай дэмаграфічнай сітуацыі;
- сацыяльная, эканамічная і рэлігійная структура ,беларускай меншасці ў Латвіі;
- палітыка латвійскіх улад да беларусаў на фоне агульнай нацыянальнай палітыкі латвійскай дзяржавы ў часы парламенцкай дэмакратыі і аўтарытарнага рэжыму;
- грамадска-палітычная і культурна-асветная актыўнасць беларусаў Латвіі;
- арганізацыя і дзейнасць беларускіх школ;
- стаўленне беларускага насельніцтва да нацыянальнай працы;
- палітычныя погляды латвійскіх беларусаў і іх стаўленне да латвійскай дзяржавы;
- кантакты латвійскіх беларусаў з Савецкай Беларуссю;
- адносіны паміж латвійскімі беларускамі і іх суайчыннікамі ў іншых краінах;
- узаемадачыненні паміж мясцовым беларускім рухам і прадстаўнікамі іншых народаў, перадусім – палякамі і рускімі.

Належыць прызнаць, што гісторыя беларускага руху ў Латвіі да сённяшняга часу даследаваная ў нязначнай ступені. Першую спробу расказаць пра сваю прысутнасць над Даўгавай зрабілі самі латвійскія беларусы. Тут належыць звярнуць увагу на піянерская працы К. Езавітава. У Вільні ў 1923 г. ён выдаў брашуру *Становішча беларускае школы ў Латвіі*, нарыс нараджэння

і першых крокаў школьнай справы беларускай меншасці[1]. У 1927 г. у Рызе пабачыла свет яго кніга *Беларусы ў Латвіі*[2]. Пяру гэтага дзеяча належыць таксама шэраг меншых публікацый прысвечаных асобным эпізодам беларускай дзейнасці ў Латвіі ў міжваенны перыяд. Працяглы час праца К. Езавітава была адзінай спробай сінтэзу гісторыі латвійскіх беларусаў, таму не павінна здзіўляць, што на яе спасылаліся даследчыкі міжваеннага, ваеннага і нават постсавецкага перыядаў[3]. Можна таксама ўзгадаць нарысы гісторыі дзвюх беларускіх школ – Даўгаўпілскай дзяржаўнай беларускай гімназіі[4] і 1-й Рыжскай беларускай пачатковай школы[5], аўтарства адпаведна Сяргея Сахарава і Сцяпана Сіцько. Працяглы час гэтыя працы былі адзінымі крыніцамі інфармацыі па гісторыі беларускай меншасці ў Латвіі. Аўтарамі гістарычных нарысаў міжваеннага перыяду кіравала жаданне пакінуць памяць пра плён сваёй працы на культурна-асветнай ніве. Характэрнай рысай тых тэстаў з'яўляецца адсутнасць глыбокага аналізу апісаных падзей, і адначасова насычанасць факталагічным матэрыялам (напрыклад, спісы настаўнікаў і выпускнікоў). Беларуская прысутнасць у Латвіі ў міжваенны час была таксама прадметам увагі ў Савецкай Беларусі. На пачатку 1930-х гг. у Менску пабачыла свет адыёзная брашура Янкі Доўгага *Беларускі нацыянал-фашызм у Латвіі*[6]. Гэтае выданне прапагандысцкага характару мела на мэце дыскрэдытацыю дзеячаў беларускага руху. Тым не менш, сам факт з'яўлення брашуры дазваляе зрабіць высновы наконт стаўлення камуністычных улад у Менску да суайчыннікаў у Латвіі.

У часы СССР праблематыка беларускай меншасці ў Латвіі амаль не даследавалася. Кіраўніцтва СССР не бачыла патрэбы асвятляць нацыянальныя справы ў краіне, дзе афіцыйна не існавала нацыяналізму. Таму працы гэтага перыяду тычыліся культурнага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Латвіяй, а пытанні беларускай меншасці заставаліся па-за ўвагай. Акрамя таго, многія лідары беларускага руху Латвіі ў 1918–1940-я гг. у савецкай гістарыяграфіі лічыліся крамольнымі. Яскравым прыкладам з'яўляецца стаўленне да піянера беларускай дзейнасці ў Латвіі Кастуся Езавітава, які, калі і згадваўся савецкімі

---

[1] К. Езавітаў, *Становішча беларускае школы ў Латвіі*, Вільня 1923.

[2] К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, Рыга 1927 [перадрук: Нью-Ёрк – Менск 2013].

[3] У якасці прыкладу можна прывесці папулярны нарыс гісторыі Беларусі Язэпа Найдзюка, які выйшаў у акупаваным немцамі Менску ў 1944 г. На падставе кнігі К. Езавітава аўтар прадставіў разгорнуты матэрыял пра беларускую дзейнасць у міжваеннай Латвіі. Перавыданне: Я. Найдзюк, І. Касяк, *Беларусь учора й сяньня*, Менск 1993, с. 221–228.

[4] *Гістарычны нарыс пяцігодзьдзя Дзьвінскай Дзяржаўнай Беларускай Гімназіі за 1922–1927 г.г.*, укл.: С. Сахараў, Дзьвінск 1927.

[5] С. Сіцько, *Дзесяцігодзьдзе 1-ае Рыжскае беларускае аснаўное школы, 1923–1933*, прадм.: К. Езавітаў, Рыга 1934.

[6] Я. Доўгі, *Беларускі нацыянал-фашызм у Латвіі*, Менск 1934.

аўтарамі, дык толькі ў працах, прысвечаных "буржуазным нацыяналістам" і выключна ў адмоўным святле. Інакш было на Захадзе, дзе пасля вайны апынуліся некаторыя ўдзельнікі беларускага руху міжваеннай і ваеннай Латвіі. Адзін з іх – Пятро Мірановіч – падрыхтаваў артыкул пра беларускае жыццё ў Латвійскай Рэспубліцы[7]. Аднак эмігранты не мелі доступу да архіваў, таму іх публікацыі належыць разглядаць хутчэй як мемуарную літаратуру.

Пасля распаду Савецкага Саюза і абвяшчэння незалежнасці Беларусі ў 1991 г. беларускія даследчыкі атрымалі магчымасць займацца праблемамі, якія раней лічыліся непажаданымі альбо забароненымі. У гэты час назіраўся рост цікавасці да гісторыі беларускага замежжа. Можна было б спадзявацца на з'яўленнне прац, прысвечаных латвійскім беларусам, аднак тэма калі і закраналася, дык толькі эпізадычна, падчас даследавання іншых праблем. Навуковых і навукова-папулярных артыкулаў дачакаліся асобныя дзеячы беларускага руху Латвіі. У першую чаргу даследчыкі звярнуліся да постацяў Кастуся Езавітава і Сяргея Сахарава. Сярод тых публікацый варта згадаць артыкулы Надзеі Слукі, Марыны Ліс, Аляксандра Вабішчэвіча, Валянціны Герасімавай, Святланы Раўнейкі і інш.[8] Некаторыя аспекты нацыянальна-асветнай і культурнай дзейнасці беларусаў у міжваеннай латвійскай дзяржаве (адукацыя, прэса, выдавецкая справа) закраналіся ў публікацыях мовазнаўцаў і гісторыкаў, у тым ліку Юліі Габранавай, Наталлі Голубевай, Уладзіміра Ляхоўскага і Аляксандра Чарняўскага[9]. На асобную ўвагу заслугоўвае

---

[7] П. Мірановіч, *Беларусы ў Латвіі*, "Запісы БІНіМ" 1978, № 16, с. 92–98.

[8] А. Вабішчэвіч, *Але ж шлях да свабоды старонка праложа!* [у:] *Сыны і пасынкі Беларусі*, рэд. С. Барыс і інш., Менск 1996, с. 313–344; В. Герасімаў, *Да праўды сьветлай, братка, йдзі!* [у:] "Полымя" 1994, № 4; М. Ліс, *Літаратурна-публіцыстычная дзейнасць С.П. Сахарава* [у:] *Інфармацыйнае забеспячэнне навукі: праблемы, пошукі, рашэнні. Зборнік навуковых артыкулаў*, Менск 2000, с. 130–134; Яна ж, *Педагагічная і культурна-асветніцкая дзейнасць С.П. Сахарава*, "Весці Акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук" 1995, № 3, с. 99–105; Яна ж, *Сяргей Сахараў. Асветнік, змаганец, фальклярыст*, "Літаратура і мастацтва" 1993, № 52, с. 13; Яна ж, *Сяргей Сахараў і беларуска-балцкія сувязі*, "Кантакты і дыялогі" 1996, № 10, с. 16–20; Н.М. Слука, *Часопісы беларускай эміграцыі ў Латвіі ў міжваенны перыяд (на аснове фондаў рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі)* [у:] *Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі*, Менск 2013, с. 189–195; С. Раўнейка, *Беларуская дыяспара ў Рызе ў пачатку XX ст. (па матэрыялах даследавання К. Езавітава) Айчынная і сусветная гісторыя: сучасныя погляды і метады даследаванняў: Зб. навук. прац: У 2 ч. Ч. 2: Актуальныя пытанні ўсеагульнай гісторыі і гісторыі Беларусі,* Менск 2003, с. 202–207; С. Раўнейка, *Беларуская меншасць у Латвіі ў 20-х – пачатку 30-х гг. ст. (па матэрыялах даследавання К. Езавітава)* [у:] *Айчынная і сусветная гісторыя: сучасныя погляды і метады даследавання. Зборнік навуковых прац. У 2 ч. Ч. 1. Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі*, Менск 2002, с. 125–130.

[9] Ю. Габранава, *"Голас Беларуса" – газета беларускай дыяспары ў Латвіі пачатку XX стагоддзя*, "Беларуская лінгвістыка" 2015, т. 75, с. 85–91; J. Gabranova, *Baltkrievu un latviešu valodas kontakti 20. gadsimta pirmajā pusē un mūsdienās*, Promocijas darbs filoloģijas doktora grāda iegūšanai

серыя прац *Крывіцкія руны*, а таксама зборнік творчасці Сяргея і Вольгі Сахаравых, Пятра Сокала і Валянціны Казлоўскай. Гэтыя выданні выйшлі пад рэдакцыяй Сяргея Панізніка і Міхася Казлоўскага. Да сённяшняга дня яны застаюцца адзінымі, што былі цалкам прысвечаныя беларускай меншасці ў Латвіі ў XX ст. Праўда, у гэтым выпадку мы маем справу не з навуковай апрацоўкай, а з публікацыямі малавядомых і невядомых раней крыніц і матэрыялаў па гісторыі беларускага жыцця ў Латвіі[10]. Адзін з эпізодаў беларускай нацыянальнай актыўнасці ў Латвіі звязаны з дзейнасцю прадстаўніцтваў Беларускай Народнай Рэспублікі. У нашай працы былі выкарыстаны даследаванні, прысвечаныя органам БНР у Латвіі ў 1919–1921 гг. У прыватнасці, працы Таццяны Паўлавай, Андрэя Ціхаміравa, Юрася Юркевіча, Андрэя Чарнякевіча[11].

Праблематыка беларускай меншасці ў Латвіі з'яўлялася прадметам увагі некаторых латвійскіх навукоўцаў. Упершыню беларуская меншасць трапіла ў поле даследчыцкай увагі яшчэ ў міжваенны час. У 1938 г. пабачыла свет праца латышскага пісьменніка і латгальскага грамадскага дзеяча Вільбертса Краснайса (*Vilberts Krasnais*), якая мела назву *Baltkrievi kā latviešu tautas zars* (*Беларусы як адгалінаванне латвійскага народа*). Змест цалкам адпавядаў тагачаснай нацыянальнай палітыцы латвійскіх улад, скіраванай на асіміляцыю нацменаў: праца навукова даводзіла неіснаванне латгальскіх беларусаў[12]. У падобным рэчышчы была напісаная і кніга латгальскага дзеяча і палітыка Францыса Кемпса (*Francis Kemps*), што таксама лічыў латгальскіх беларусаў

---

valodniecības zinātņu nozares salīdzināmās un sastatāmās valodniecības apakšnozarē, Liepāja 2016; J. Gabranova, *Education system in Belarusian in Latvia: history and overview,* (in:) *In the Shadow of Others. Belarusia-Latvian Relations from the Past to Nowadays*, ed. Mirosław Jankowiak, Kiryl Kascian, Praha 2022, s. 293–312; Н. Голубева, *Беларусы ў Латвіі* [у:] *Беларускае замежжа*, рэд. Н. Голубева, Менск 2010, с. 188–203; У. Ляхоўскі, *Ад гоманаўцаў да гайсакоў. Чыннасць беларускіх моладзёвых арганізацый у 2-й палове XIX ст – 1-й палове XX ст. (да 1939 г.)*, Смаленск 2015; А. Чарняўскі, *Роля адукацыі ў культурна-асветніцкай дзейнасці беларускай нацыянальнай меншасці ў Латвіі (1918–1940 гг.)*, "Труды БГТУ. Серия: история, философия" 2023, № 1, с. 66–72.

[10] *Крывіцкія руны: Беларускія пісьменнікі Латвіі*, уклад., прадм., камент.: М. Казлоўскі, С. Панізнік, Менск 2003; С. Сахараў, В. Сахарава, *Выбраныя творы*, Менск 2015; П. Сокал, В. Казлоўская, *Выбраныя творы*, Менск 2016; *Крывіцкія руны. Вып. II: Беларускі культурны мацярык у Латвіі*, уклад., прадм., камент.: М. Казлоўскі, С. Панізнік, Менск 2017; *Крывіцкія руны. Вып. III: Беларускі культурны мацярык у Латвіі*, уклад., прадм., камент.: М. Казлоўскі, С. Панізьнік, Менск 2019.

[11] Т. Павлова, *Дипломатия БНР в 1918–1925 гг.* [в:] *Внешняя политика Беларуси в исторической ретроспективе*, Минск 2002; А. Ціхаміраў, *Беларусь у сістэме міжнародных адносін перыяду паслваеннага ўладкавання Еўропы і польска-савецкай вайны (1918–1921 гг.)*, Менск 2003; Ю. Юркевіч, *Стварэнне і дзейнасць Асобнага атрада БНР у Балтыі* [у:] *Балахоўцы. Сведчанні. Дакументы. Даследаванні*, 2-у выданне, пераклад, прадмова і каментары: А. Вашкевіч, А. Чарнякевіч, Ю. Юркевіч, Смаленск 2014, с. 25–158; А. Чернякевич, *БНР: Триумф побежденных*, Минск 2018.

[12] V. Krasnais, *Baltkrievi kā latviešu tautas zars,* Rīgā 1938.

латальцамі, якія ў выніку гістарычнай завірух страцілі сваю мову[13]. Пэўныя згадкі пра латвійскіх беларусаў утрымлівае праца дэмографа і палітыка Маргерса Скуеніекса (*Marģers Skujenieks*), прысвечаная насельніцтву Латвіі. Аўтар залічваў беларусаў да групы "рускамоўных"[14].

У сучасны перыяд упершыню даследаваннем беларусаў Латвіі занялася Ілга Апіня (*Ilga Apine*), якая паспрабавала асэнсаваць іх гісторыю з сацыялагічнай і культурнай рэтраспектыў[15]. Спробу аналізу гісторыі беларускай меншасці ў разгляданы час зрабіў Эрыкс Екабсонс, які апублікаваў шэраг грунтоўных артыкулаў пра латвійскіх беларусаў у 1918–1940 гг.[16] Каштоўнасць прац гэтага даследчыка ў тым, што, дзякуючы ім, у навуковы зварот былі ўведзеныя раней некарыстаныя крыніцы з латвійскіх архіваў. Аўтар паставіў за мэту стварыць агульны нарыс гісторыі беларусаў Латвіі, аднак без дэталёвага аналізу нелатвійскіх (беларускіх, польскіх, нямецкіх і савецкіх) крыніц. Публікацыі латвійскага гісторыка адыгрываюць ролю своесаблівых архіўных шляхаводаў і заахвочваюць да далейшага даследавання розных аспектаў жыцця беларускай меншасці ў Латвіі. У апошнія гады з'явіліся публікацыі Міланы Другавейка (*Milana Drugoveiko*), прысвечаныя асобным аспектам дзейнасці К. Езавітава[17]. Гісторыі латвійскіх беларусаў прысвечаная выдавецкая серыя *Латышы і беларусы: разам праз стагоддзі*, складзеная беларускімі і латвійскімі даследчыкамі. Увагі заслугоўваюць працы Таццяны Кузняцовай, Марыса Голдманіса, Кацярыны Казачонак і Вольгі Шыдлоўскай[18].

---

[13] Francis Kemps, *Latgales likteņi: ainas no senas un jaunākās pagātnes*, Rēzekne 1938.

[14] M. Skujenieks, *Latvija. Zeme un iedzīvotāji*, Rīga1927.

[15] I. Apine, *Baltkrievi Latvijā*, Rīga 1995.

[16] Э. Екабсонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [в:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 47–71; Ён жа, *Выходцы с Гродненщины в общественно-политической жизни белорусов Латвии в 20–30-е г. XX в.* [в:] *Культура Гродзенскага раёну: праблемы развіцця ва ўмовах поліэтнічнага сумежжа. Зборнік навуковых прац*, Гродна 2003, с. 150–155; Idem, *Stosunki między Łotwa i Białoruską Republiką Ludową w latach 1919–1921*, "Białoruskie Zeszyty Historyczne" 1997, z. 7, s. 49–62; Э. Екабсонс, *Беларусы ў Латвіі ў часы савецкай і нямецка-фашысцкай акупацыі (1940–1945)*, "Беларускі Гістарычны Агляд" 2006, т. 13, сш. 2, с. 199–233.

[17] M. Drugoveiko, *Baltkrievu inteliģences politiskā doma Latvijā (1920–1934) Konstantīna Jezovitova piemērs*, "Latvijas Universitātes Žurnāls. Vēsture" 2023, № 13, 56.–67; M. Drugoveiko, *Konstantīna Jezovitova (1896–1946) darbības analīze Latvijā (1919–1934)*, "Jauno vēsturnieku zinātniskie lasījumi" 2021, № 7, 220.–229. lpp.; М. Друговейко, *Размышления Константина Езовитова о своей деятельности во время заключения в Рижской Центральной тюрьме в 1930 году* [в:] *Латыши и белорусы: вместе через века. Сборник научных статей*, 2024, вып 13, с. 75–89.

[18] Т. Кузнецова, *Белорусы в информационном пространстве Латвии 20–30-х годов XX века: М. Скуениекс "Латвия. Страна и жители" (M. Skujenieks "Latvija. Zeme un iedzīvotāji")* [в:] *Латыши и белорусы: вместе сквозь века*, Мінск 2015, вып 4, с. 35–40; М. Голдманис, *"Белорусский" дискурс в латышской прессе (1920–1934): эволюция представления о белорусах как о самостоятельном национальном меншинстве* [в:] *Латыши и беларусы: вместе сквозь века*,

Але гэтыя тэксты толькі часткова запаўняюць прагал у ведах пра гісторыю беларускай меншасці ў Латвіі ў міжваенны перыяд.

Некаторыя эпізоды гісторыі латвійскіх беларусаў былі прадметам увагі польскіх гісторыкаў і мовазнаўцаў. У нашай манаграфіі выкарыстаны працы навукоўцаў, якія ў пачатку і ў першай палове XX стагоддзя вывучалі гісторыю нацыянальнага складу Латгаліі. Першую спробу апісаць культурны краявід "Польскіх Інфлянтаў" зрабіў Густаў Мантойфель[19]. Яго праца дае ўяўленне пра этнакультурную мазаіку Латгаліі на мяжы XIX і XX стагоддзяў. Карыснымі падчас нашага даследавання сталіся працы міжваенных польскіх аўтараў (Казіміра Келера, Эдварда Малішэўскага, Ежы Ружыцкага, Вітольда Сваракоўскага), якія тычыліся польскага насельніцтва Латвіі[20]. Хоць аўтары засяроджвалі ўвагу на латвійскіх паляках, яны міжволі згадваюць і беларусаў, бо лёсы дзвюх меншасцей нярэдка перакрыжоўваліся. Каштоўнасць для нашай тэмы маюць і працы сучасных польскіх даследчыкаў, якія тычацца польскай прысутнасці ў Латвіі і польска-латвійскіх адносін – Януша Альбіна, Пятра Эберхарда, Кшыштафа Заяса і Анджэя Скшыпка[21]. У іх публікацыях сустракаюцца звесткі пра колькасны і нацыянальны склад краіны, палітыку латвійскіх улад у дачыненні да нацменаў. Для аналізу агульнай грамадска-палітычнай сітуацыі міжваеннай Латвіі важнай з'яўляецца праца Пятра Ласоўскага: аўтар грунтоўна ахарактарызаваў у тым ліку і становішча нелатышоў[22].

Асобным аспектам беларускага жыцця ў Латвіі прысвечаныя публікацыі гісторыка Ёанны Героўскай-Калаўр[23] і мовазнаўца Міраслава Янковяка[24].

т. 5, Минск 2016, с. 68–76; К. Казачёнок, *"Белорусский процесс" в Латвии: обвинение, оправдание, наказание* [в:] *Латыши и белорусы: вместе сквозь века*, ред. М.Г. Королёв, Минск 2012, с. 29–42; О. Шидловская, *Николай Талерко – белорусский самородок Латгалии* [в:] *Латыши и белорусы: вместе сквозь века*, т. 7, Витебск 2018, с. 72–76.

[19] G. Manteuffel, *Inflanty Polskie oraz Listy znad Bałtyku*, wstęp, red. i oprac. K. Zajas, Kraków 2009.

[20] K. Keller, *Stosunki narodowościowe, społeczne ekonomiczne i na Inflantach Polskich i polityczne w Łatgalii*, Rypin 1920; E. Maliszewski, *Polacy na Łotwie*, Warszawa 1922; J. Różycki, *Polacy na Łotwie*, Warszawa 1930; W. Sworakowski, *Polacy na Łotwie: uwagi o ich liczbie i rozmieszczeniu, składzie wyznaniowym, podziale według płci i wieku, analfabetyzmie i strukturze społeczno-gospodarczej na podstawie łotewskiego spisu ludności 1930 r.*, Warszawa 1934.

[21] K. Zajas, *Nieobecna kultura. Przypadek Inflant Polskich*, Kraków 2008; J. Albin, *Polski ruch narodowy na Łotwie w latach 1919–1940*, Wrocław 1994; A. Skrzypek, *Stosunki polsko-łotewskie 1918–1939,* Gdańsk 1997.

[22] P. Łossowski, *Kraje bałtyckie na drodze od demokracji parlamentarnej do dyktatury: 1918–1934*, Wrocław 1972.

[23] J. Gierowska-Kałłaur, *Stosunek państwa łotewskiego do miejscowych Polaków i Białorusinów w początkach niepodległości łotewskiej*, "Studia z Dziejów Rosji i Europy Środkowo-Wschodniej" 2011, t. 46, s. 181–216.

[24] M. Jankowiak, *Białorusini Łatgalii – autochtoni czy imigranci?* "Acta Albaruthenica" 2008, № 8, s. 264–274; M. Jankowiak, *Gwary białoruskie na Łotwie w rejonie krasławskim: studium*

У першым выпадку мы маем справу з даследаваннем узаемаадносін палякаў і беларусаў у Латвіі ў першыя гады яе незалежнасці, а ў другім – з аналізам гаворак латгальскіх беларусаў. Акрамя таго, у адной з публікацый М. Янковяк зрабіў спробу сістэматызаваць беларускую прэсу міжваеннай Латвіі. Асобным эпізодам беларускай нацыянальна-культурнай дзейнасці ў міжваенны час прысвечаная калектыўная праца Томаша Блашчака, Дароты Міхалюк і Ірыны Матыяш. Гэта біяграфія Івана Краскоўскага – дзеяча беларускага руху ў Латвіі на пачатку 1920-х гг. і першага кіраўніка Даўгаўпілскай беларускай гімназіі[25]. Тым часам, манаграфіі Алега Латышонка і Дароты Міхалюк асвятляюць некаторыя эпізоды актыўнасці палітыкаў БНР у Балтыі. У першую чаргу маецца на ўвазе дзейнасць Вайскова-дыпламатычнай місіі і Асобнага атрада войскаў БНР[26].

Прысутнасць беларусаў у Латвіі закраналі ў працах некаторыя расійскія даследчыкі. Згадкі пра этнакультурны склад Латгаліі пры канцы XIX ст. можна знайсці ў даследаваннях Аляксея Сапунова[27]. Сярод сучасных даследаванняў належыць адзначыць артыкул Дар'і Каратковай пра малавядомыя эпізоды дзейнасці Кастуся Езавітава. Аўтарка засяродзілася на супрацоўніцтве беларускага дзеяча з савецкімі ўладамі. Каштоўнасць публікацыі ў тым, што яна падрыхтаваная на аснове раней не даследаваных крыніц савецкай дыпламатычнай службы з Архіва знешняй палітыкі Расійскай Федэрацыі[28].

Падсумоўваючы стан гістарыяграфіі па тэме гісторыі беларусаў Латвіі ў 1918–1940 гг., можна зрабіць выснову, што праблема дасюль слаба даследаваная. Толькі асобныя аспекты былі прадметам увагі даследчыкаў. Значная частка прац тычыцца дзейнасці асобных прадстаўнікоў беларускага руху ў міжваеннай Латвіі. І зусім нязначная частка публікацый прысвечана грамадска-палітычнаму і культурна-асветнаму жыццю беларусаў Латвіі

---

socjolingwistyczne, Warszawa 2009; M. Jankowiak, *Prasa białoruska międzywojennej Łotwy (przegląd wydawnictw)*, "Studia Białorutenistyczne" 2021, t. 15, s. 11–31; M. Jankowiak, *Współczesne gwary białoruskie na Łotwie. Charakterystyka. Wybór tekstów*, Praha 2018; М. Янковяк, *Роля беларушчыны ў фарміраванні тоеснасці беларускамоўных жыхароў паўднёва-ўсходняй Латвіі і іх адносіны да іншых моў і гаворак* [у:] *Латыши и белорусы: вместе сквозь века*, т. 6, Витебск 2017, с. 111–119.

[25] T. Błaszczak, I. Matiash, D. Michaluk, *Iwan Kraskowski (1880–1955). W służbie Białorusi i Ukrainie*, Białystok 2019.

[26] O. Łatyszonek, *Białoruskie formacje wojskowe. 1917–1923*, Białystok 1995 [А. Латышонак, *Беларускія вайсковыя фармаваньні: 1917–1923 гадоў* [у:] Ён жа, *Жаўнеры БНР*, Беласток – Вільня 2009, с. 14–235]; D. Michaluk, *Białoruska Republika Ludowa 1918–1920. U podstaw białoruskiej państwowości*, Toruń 2010 [Д. Міхалюк, *Беларуская Народная Рэспубліка ў 1918–1920 гг. Ля вытокаў беларускай дзяржаўнасці*, Смаленск 2016].

[27] А. Сапунов, *Инфлянты. Исторические судьбы края, известного под названием Польских Инфлянт* (Вітебск 1886) [в:] *Памятная книжка Витебской губернии на 1887 год*, Витебск 1887.

[28] Д.А.Короткова, *Поиски союзника. Контакты советских дипломатов в Латвии с К.Б. Езовитовым в 1925–1926 гг.*, "Славянский мир в третьем тысячелетии" 2020, т. 15, № 1–2, с. 47–58.

ў міжваенныя гады. Тым часам гісторыя іншых нацыянальных груп у Латвіі (палякаў, рускіх, літоўцаў і інш.) ужо дачакаліся грунтоўных навуковых прац. Гісторыя латвійскіх беларусаў недастаткова вывучаная яшчэ і праз моўны бар'ер (значная частка крыніц па тэме — гэта дакументы на латышскай мове), а таксама праз тое, што крыніцы па дадзенай праблематыцы захоўваюцца ў розных месцах – у архівах і бібліятэках Беларусі, Латвіі, Літвы, Польшчы, Расіі, Чэхіі і г.д. У выніку даследчыкі былі вымушаныя абмяжоўвацца мясцовымі матэрыяламі. Комплекснае і ўсебаковае даследаванне, якое б грунтавалася на выкарыстанні і параўнаўчым аналізе шырокага спектра крыніц — латвійскіх, беларускіх, польскіх, нямецкіх і інш. — адсутнічае. Аўтар гэтых радкоў на працягу некалькіх гадоў намагаўся прынамсі часткова запоўніць "белую пляму", публікуючы навуковыя артыкулы прысвечаных розным эпізодам і аспектам беларускага жыцця ў Латвіі ў 1920–1940-я гг.[29]

Важнай дапаможнай крыніцай па гісторыі беларусаў Латвіі ў разгляданы перыяд з'яўляецца мемуарная літаратура. У нашай працы выкарыстаны ўспаміны, дзённікі і эпісталярная спадчына дзеячаў беларускага руху ў Латвіі, такіх, як Кастусь Езавітаў, Паўліна Мядзёлка-Грыб, Пятро Сокал, Сяргей і Вольга Сахаравы. Аднак многія ўдзельнікі мясцовага беларускага руху не пакінулі ўспамінаў.

Падчас даследавання мы карысталіся матэрыяламі беларускіх, польскіх і рускіх перыядычных выданняў Латвіі міжваеннага перыяду, а таксама заходнебеларускай і савецкай прэсай. Параўнаўчы аналіз перыёдыкаў дазваляе лепей зразумець узаемаадносіны беларусаў з іншымі нацыянальнымі меншасцямі ў Латвіі: палякамі і рускімі. Цяжкасць вывучэння перыёдыкі ў тым, што яна захоўваецца ў розных месцах. Асноўны масіў беларускамоўных, польскамоўных і рускамоўных выданняў вывучаўся ў Латвійскай нацыянальнай бібліятэцы ў Рызе і Славянскай бібліятэцы ў Празе. Тым часам, заходнебеларуская прэса даследавалася ў зборах Бібліятэкі Літоўскай акадэміі навук.

---

[29] J. Grzybowski, *Савецкая рэчаіснасць на бачынах беларускай газеты ў Латвіі "Голас Беларуса" (1925–1929 г.)* [у:] *"Światła masz tyle w sobie...". Ze studiów wschodniosłowiańskich. Księga pamiątkowa dedykowana Profesorowi Aleksandrowi Barszczewskiemu w osiemdziesiątą piątą rocznicę urodzin*, red. M. Kaczmarczyk, A. Nowacki, M. Sidor, B. Siwek, Lublin 2015, s. 207–222; Ю. Грыбоўскі, *Узаемадачыненні паміж польскім і беларускім рухамі ў Латвіі (1920–1940)* [у:] *Зъ зычливости ку моеи отчизне. Tom pamiątkowy dedykowany profesorowi Mikołajowi Timoszukowi*, Warszawa 2017, s. 129–156; Ю. Грыбоўскі, *Удзел беларусаў у парламенцкіх выбарах у Латвіі (1922–1931)*, "Беларускі гістарычны агляд" 2018, т. 25, с. 111–148; Ю. Грыбоўскі, *"Латвійскі" перыяд дзейнасці Мікалая Дзямідава (1922–1942)*, "Беларускі гістарычны агляд" 2016, т. 23, с. 41–71; Ю. Грыбоўскі, *Да гісторыі беларускай школы ў Латвіі пад нямецкай акупацыяй (1941–1944 г.)*, "Rocznik Centrum Studiów Białoruskich" 2017, t. 3, s. 38–92; Ю. Грыбоўскі, *З гісторыі беларускага руху ў Латвіі ў міжваенны і ваенны перыяды*, "Запісы БІНіМ" 2016, сш. 38, с. 457–480.

Не менш каштоўнымі падчас падрыхтоўкі даследавання былі апублікаваныя крыніцы, якія ўтрымліваюць дакументы, прысвечаныя асобным эпізодам грамадска-палітычнага і культурна-асветнага жыцця беларусаў Латвіі. Мы карысталіся такімі фундаментальнымі шматтомнымі працамі, якія *Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі* і *Знешняя палітыка Беларусі*, якія дазваляюць прааналізаваць дзейнасць БНР у Латвіі, а таксама палітыку БССР у дачыненні да латвійскіх беларусаў. Поўны пералік выкарыстанай літаратуры знаходзіцца ў бібліяграфічным спісе.

Аснову нашага даследавання складаюць раней непублікаваныя архіўныя крыніцы, якія захоўваюцца ў Беларусі, Латвіі, Літве, Польшчы, Чэхіі, Расіі, ЗША і Эстоніі. Агляд гэтых крыніц належыць пачаць з дакументаў, якія захоўваюцца ў зборах Латвійскага нацыянальнага архіва, што структурна складаецца з двух устаноў: Латвійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва і Латвійскага дзяржаўнага архіва. Менавіта гэтая дакументацыя з'яўляецца галоўнай крыніцай ведаў па гісторыі латвійскіх беларусаў. У зборах першага знаходзяцца фонды беларускіх культурна-асветных арганізацый (таварыства "Беларуская хата", Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў, Беларускага таварыства ў Латвіі і інш.) і латвійскіх дзяржаўных устаноў, якія адказвалі за пытанні асветы беларускай меншасці. Асаблівую каштоўнасць мае фонд Беларускага школьнага аддзела Міністэрства асветы, які складаецца з дакументаў пра стварэнне і дзейнасць дадзенай установы. Іншай істотнай крыніцай з'яўляюцца фонды беларускіх сярэдніх (Даўгаўпілскай дзяржаўнай беларускай гімназіі і Лудзенскай дзяржаўнай беларускай гімназіі) і некаторых пачатковых школ. У архіўных зборах у вялікім аб'ёме захавалася ўнутраная дакументацыя вышэйзгаданых устаноў і арганізацый (пратаколы паседжанняў кіроўных органаў, службовыя справаздачы, ліставанне паміж цэнтральнымі і мясцовымі структурамі). Аналіз гэтых дакументаў дазваляе падрабязна рэканструяваць культурна-асветнае і грамадска-палітычнае жыццё беларускай меншасці, а таксама арганізацыю і дзейнасць беларускіх школ у міжваеннай Латвіі. У фондзе Палітычнага ўпраўлення паліцыі захоўваюцца звесткі пра асобных беларусаў Латвіі, дзейнасць якіх была прадметам увагі латвійскіх улад (напрыклад, К. Езавітава). У прыватнасці, у паліцэйскім архіве апынулася частка асабістага ліставання К. Езавітава з дзеячамі БССР – лісты былі канфіскаваныя падчас яго затрымання па падазрэнні ў антыдзяржаўнай дзейнасці. З дапамогай дакументаў з фонду Латвійскага ўніверсітэта можна ўдакладніць істотныя факты пра жыццё і дзейнасць яго беларускіх студэнтаў. У фондах Польскага консульства ў Рызе і Латвійскай сельскагаспадарчай палаты мы вывучалі дакументы, датычныя польскіх грамадзян беларускай нацыянальнасці, якія знаходзіліся ў міжваеннай Латвіі ў якасці эканамічных мігрантаў.

Не менш каштоўнымі з'яўляюцца дакументы і матэрыялы са збораў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. Асобны пласт крыніц – фонды, якія

тычацца дзейнасці структур Беларускай Народнай Рэспублікі на тэрыторыі Латвіі ў 1919–1921 гг. Да іх ліку належаць два фонды – Народнага сакратарыята БНР (у ім захоўваецца частка дакументаў Вайскова-дыпламатычнай місіі) і Консульства БНР у Рызе. Важнай крыніцай па тэме гісторыі беларусаў Латвіі з'яўляецца асабісты фонд Кастуся Езавітава, які ўтрымлівае яго багатае ліставанне з іншымі ўдзельнікамі беларускага руху. Яго фонд дае уяўленне пра многія аспекты беларускай палітычнай і культутна-асветнай працы ў Латвіі. Цікавыя крыніцы знаходзяцца таксама ў калекцыі Беларускага музея імя Івана Луцкевіча, якая захоўваецца ў зборах Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва. На жаль, з аб'ектыўных тэхнічных прычын па-за нашай даследчыцкай увагай засталіся дакументы і матэрыялы са збораў Навуковай бібліятэкі НАН Беларусі імя Якуба Коласа. У аддзеле рукапісаў гэтай установы знаходзяцца асабістыя калекцыі дзеячаў беларускага руху ў Латвіі: Сяргея Сахарава, Івана Краскоўскага і Уладзіміра Пігулеўскага. Аднак аналіз даступных крыніц дазваляе меркаваць, што згаданыя матэрыялы не маглі б істотным чынам паўплываць на высновы, зробленыя на падставе багатай крыніцавай базы, выкарыстанай у нашай манаграфіі.

У Архіве новых актаў у Варшаве даследаваліся дакументы з фонду МЗС Польшчы, якія ўтрымліваюць звесткі пра становішча беларускай меншасці ў Латвіі напярэдадні II сусветнай вайны. Гаворка ідзе пра рапарты і справаздачы Пасольства Польшчы ў Рызе. У гэтым жа архіве (у фондах МЗС і Міністэрства сацыяльнай абароны) знаходзіцца багатая дакументацыя па гісторыі працоўнай міграцыі з Заходняй Беларусі ў Латвію ў міжваенны перыяд.

Некаторыя дакументы пра беларускі рух у Латвіі ў міжваенны час захоўваюцца ў Літоўскім цэнтральным дзяржаўным архіве, а таксама ў аддзеле рукапісаў Бібліятэкі Літоўскай акадэміі навук. У першым выпадку гаворка ідзе пра архіў Народнага сакратарыяту БНР і беларускіх замежных арганізацый міжваеннага часу, а ў другім – пра дакументацыю віленскіх беларускіх арганізацый, якія ў міжваенны час падтрымлівалі сувязі з латвійскімі беларусамі. На падставе гэтых дакументаў можна прасачыць міжнародныя кантакты латвійскіх беларусаў.

Шэраг фондаў (галоўным чынам МЗС Эстоніі) Эстонскага дзяржаўнага архіва ў Таліне ўтрымлівае дакументы пра дзейнасць дыпламатычнай службы БНР у Латвійскай Рэспубліцы ў 1919–1921 гг. Гэта дакументацыя трапіла ў зборы эстонскага архіва невыпадкова: Вайскова-дыпламатычная місія БНР з сядзібай у Рызе дзейнічала і на тэрыторыі Эстонскай Рэспублікі.

Каштоўнасць уяўляюць матэрыялы, якія захоўваюцца ў Архіве Інстытута Гувера ў Стэндфардзе (Каліфорнія). Гэта дакументы з асабістага архіва Кастуся Езавітава, што некалькі гадоў таму трапілі ў зборы вышэйзгаданай установы. Архіў складаецца з дакументаў, захопленых савецкай контрвыведкай падчас затрымання беларускага дзеяча ў красавіку 1945 года.

У Дзяржаўным архіве Расійскай Федэрацыі прадметам нашай увагі былі дакументы з фонду Івана Ермачэнкі. У ім знаходзяцца каштоўныя крыніцы на тэму ўзаемаадносін беларускіх дзеячаў Латвіі з іншымі цэнтрамі беларускага жыцця напярэдадні II сусветнай вайны. У прыватнасці, гаворка ідзе пра ліставанне лідара латвійскіх беларусаў К. Езавітава са старшынёй Рады БНР Васілём Захаркам і іншымі палітычнымі эмігрантамі.

Асобныя крыніцы па гісторыі латвійскіх беларусаў мы вывучалі ў фондзе МЗС Чэхаславакіі (Нацыянальны архіў Чэхіі, Прага). Маюцца на ўвазе дакументы, што тычацца латвійскіх грамадзян беларускай нацыянальнасці, якія ў міжваенныя гады вучыліся ва ўніверсітэтах Чэхаславацкай Рэспублікі. Некаторыя дакументы, прысвечаныя асобным эпізодам беларускай дзейнасці ў міжваеннай Латвіі, былі выяўленыя намі ў зборах Славянскай бібліятэкі (Нацыянальная бібліятэка Чэхіі, Прага) і Расійскага дзяржаўнага вайсковага архіва (Масква).

Наша даследаванне мае храналагічна-праблемны парадак, які дазваляе больш грунтоўна прадставіць такую складаную і шматаспектную праблему, якой з'яўляецца гісторыя беларусаў Латвіі ў разгляданы час. Манаграфія складаецца з пяці раздзелаў. У першым раздзеле разглядаецца працэс фарміравання беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці ў Латвіі на мяжы XIX і XX стагоддзяў, а таксама першыя праявы арганізацыйнай працы беларусаў падчас дзейнасці вайскова-дыпламатычных структур Беларускай Народнай Рэспублікі ў 1919–1921 гг. У другім раздзеле аналізуецца грамадская і нацыянальна-культурная актыўнасць беларусаў у Латвійскай Рэспубліцы ў мірных умовах, да моманту беларускага працэсу (1921–1925 гг.). У згаданы перыяд з'яўляліся і фарміраваліся першыя культурна-асветныя структуры беларускай меншасці, можна бачыць іх росквіт і часовы параліч, выкліканы следствам і судовым працэсам. Трэці раздзел прысвечаны беларускай нацыянальнай працы ў латвійскай дзяржаве пасля беларускага працэсу і да моманту ўсталявання ў краіне аўтарытарнага кіравання (1925–1934 гг.). Гэты перыяд вызначаўся найбольш актыўнай дзейнасцю на грамадскай і культурна-асветнай ніве. Багатыя архіўныя зборы дазваляюць падрабязна прадставіць дзейнасць грамадска-культурных арганізацый, а таксама беларускіх пачатковых і сярэдніх школ у Латвіі, якое было галоўным сведчаннем нацыянальнай актыўнасці беларусаў у гэтай краіне. На прыкладзе працы арганізацый і школьных устаноў можна ўявіць узлёты і падзенні, дасягненні і паразы мясцовага беларускага жыцця. Чацвёрты раздзел прысвечаны палітычнай актыўнасці беларусаў Латвіі, дачыненням з прадстаўнікамі польскай і рускай меншасці, адносінам латвійскіх беларусаў з уладамі БССР і з беларускімі нацыянальнымі цэнтрамі ў іншых краінах. Апошні, пяты раздзел распавядае пра сітуацыю беларускай меншасці пасля ўсталявання ў краіне аўтарытарнага ладу (1934–1940 гг.), калі правы нацыянальных меншасцяў

былі абмежаваныя. У гэтым раздзеле таксама асвятляецца побыт у Латвіі заходнебеларускіх сельскагаспадарчых мігрантаў.

Тлумачэння патрабуе падыход да адлюстравання тапанімікі ў кнізе. Гістарычна склалася так, што на латвійскіх землях існуюць розныя тапанімічныя традыцыі: латышская, беларуская, нямецкая, польская, руская. Аўтар вырашыў карыстацца сучаснымі латышскімі геаграфічнымі назвамі, нават калі яны маюць беларускія адпаведнікі. Такім чынам, мы будзем выкарыстоўваць: Даўгаўпілс і Даўгаўпілскі замест Дзвінск і Дзвінскі, Лудза і Лудзенскі замест Люцын і Люцынскі, Краслава замест Краслаўка, Рэжыкнэ замест Рэжыца, Ліепая замест Лібава і г.д.

Аўтар выказвае шчырую падзяку ўсім, хто спрычыніўся да падрыхтоўкі і выдання гэтай манаграфіі. У першую чаргу хачу падзякаваць сябрам-гісторыкам Эрыксу Екабсонсу, Дангірасу Мачулісу, Рудолфсу Рубенісу, Алесю Пашкевічу, Віталю Макарэвічу, Анатолю Вялікаму, Наталлі Гардзіенка, Юрыю Гардзееву і, на жаль, ужо нябожчыку св. пам. Уладзіміру Ляхоўскаму. Словы ўдзячнасці кірую таксама Юрысу Пойкансу, амбасадару Латвійскай Рэспублікі ў Польшчы. Вельмі ўдзячны маёй жонцы Мажэне, якая бездакорна падтрымлівала мяне падчас працы над гэтай кнігай.

РАЗДЗЕЛ I

Перыяд змагання за незалежнасць Латвіі і Беларусі (1918–1921)

Беларусы ў Латвіі да пачатку XX стагоддзя: генезіс і ідэнтычнасць

Сучасныя дэмографы адзначаюць, што Латвія вылучаецца на фоне астатніх балтыйскіх краін разнастайнейшай нацыянальна-культурнай структурай. Этнаканфесійная і моўная стракатасць краіны з'яўляецца вынікам складаных гістарычных працэсаў, якія адбываліся на латвійскай зямлі цягам стагоддзяў[1]. Пад уплывам бурлівых нацыянальна-культурных і сацыяльна-эканамічных змен сфарміраваліся наступныя гістарычныя рэгіёны Латвіі: Курляндыя – *Kurzeme*, Відзэмэ – *Vidzeme*, Земгалія – *Zemgale*) і Латгалія (*Latgale*). Увагу даследчыка гісторыі беларускай меншасці ў Латвіі прыцягвае апошняя, бо менавіта на латгальскім нацыянальна-культурным краявідзе з'явіліся беларусы. Рэгіён знаходзіцца ў паўднёва-ўсходняй частцы Латвіі і мяжуе з Беларуссю. Спачатку Латгалія і іншыя латвійскія рэгіёны былі адзінай культурнай і гістарычнай прасторай. У старажытнасці тэрыторыя цяперашняй Латвіі была заселеная фіна-вугорскімі плямёнамі. У II тысячагоддзі н.э. тут з'явіліся балцкія плямёны, пачалі мяшацца з тубыльцамі і паступова іх асімілявалі. У выніку гэтага працэсу сфарміраваліся плямёны лагталаў, селаў, куршаў і інш. У IX ст. пачалася экспансія ўсходніх славянаў, якія прыйшло з поўдня – з тэрыторыі сучаснай Беларусі. Мясцовыя балты сутыкнуліся найперш з плямёнамі крывічоў. З гэтага часу ў палітычным, культурным і эканамічным сэнсе паўднёва-ўсходняя Латвіі быў шчыльна звязаны з усходнеславянскім светам. Ад X ст. славяне мелі ўласную дзяржаўнасць,

[1] P. Eberhardt, *Problematyka narodowościowa Łotwy*, "Zeszyty IGiPZ", № 54 (Warszawa 1998), s. 5.

пісьмовасць і монатэістычную рэлігію. Невыпадкова, што крывічы адыгрывалі галоўную ролю ў балта-славянскіх дачыненнях у Латвіі, а таксама вызначалі іх характар і змест. Тэрыторыя Латвіі мела асаблівае значэнне для палітычнага і гаспадарчага развіцця Полацкага княства, паколькі праз яе праходзіў гандлёвы шлях "з варагаў у грэкі". На землях латгалаў і ліваў палачане заснавалі два гарады-княствы – Герцыке і Кукенойс. У гэтых гарадах княжылі полацкія намеснікі. Узаемаадносіны паміж полацкімі крывічамі і мясцовым насельніцтвам наогул характарызаваліся мірным суіснаваннем. Залежнасць мясцовага балцкага і угра-фінскага насельніцтва – ліваў і латгалаў – выяўлялася ў тым, што яно плаціла даніну полацкім валадарам. Гістарычныя крыніцы сведчаць, што існавалі не толькі палітычныя і эканамічныя кантакты, але і ўзаемапранікненне культур. Паступова мясцовае жыхарства пачала пераймаць звычаі крывічоў. З Полацка на латвійскія землі прыйшло хрысціянства ўсходняга абраду, якое прыняла частка тутэйшай арыстакратыі. Уплывы крывічоў на продкаў латышоў адчувальныя нават сёння. У латышскай мове словы *krievi* і *baltkrievi* азначаюць адпаведна "рускія" і "беларусы"[2]. Верагодна, што з пашырэннем у Сярэднявеччы полацкіх уплываў у рэгіёне адбывалася пранікненне праваслаўя на землі, дзе раней панавала паганства. Істотным было тое, што экспансія новай веры адбывалася без вынішчэння і гвалту[3].

У XIII ст. палітычныя ўплывы Полацка былі выціснутыя заходнееўрапейскімі, калі гэтыя землі сталі часткай уладанняў Ордэна мечаносцаў (пазней Лівонскага ордэна) заснаванага ў 1202 годзе. Гэтыя падзеі далі пачатак шматвяковаму дамінаванню ў рэгіёне нямецкага рыцарства, што падпарадкавала сабе мясцовае балцкае жыхарства. З ліку рыцараў паходзіла мясцовая землеўласніцкая арыстакратыя, якая стварыла на захопленых землях шмат здабыткаў матэрыяльнай і духоўнай культуры. Яе прысутнасць адлюстравалася ў назвах латвійскіх населеных пунктаў, большасць якіх мае нямецкамоўныя адпаведнікі. Ад сярэдзіны XVI ст. Латгалія знаходзілася ў складзе Рэчы Паспалітай. Адбылося гэта ў выніку Лівонскай вайны, падчас якой апошні гросмайстар Лівонскага ордэна Готхард Кетлер прызнаў сябе васалам Вялікага Княства Літоўскага, якое, у сваю чаргу, у 1569 г. стала часткай Рэчы Паспалітай. Пасля далучэння Латгаліі да Рэчы Паспалітай у рэгіёне адбыліся канфесійныя змены. Ад XVI ст. там пачынаецца актыўная місійная дзейнасць каталіцкіх ордэнаў: езуітаў, дамініканцаў і інш. Каталіцтва

---

[2] M. Jankowiak, *Białorusini Łatgalii – autochtoni czy imigranci?* "Acta Albaruthenica" 2008, № 8, s. 267.

[3] А. Сапунов, *Инфлянты. Исторические судьбы края, известного под названием Польских Инфлянт* (Вітебск 1886), (в:) *Памятная книжка Витебской губернии на 1887 год*, Витебск 1887, с. 7.

здабыло пазіцыю дамінантнай канфесіі, але побач існавалі іншыя веравызнанні: праваслаўе, стараверства, пратэстантызм, юдаізм. У рэгіён пачынаюць пранікаць польскія культурныя ўплывы. Паступова нашчадкі мясцовых нямецкіх магнацкіх родаў прынялі польскую культуру і мову. Іх лёс падзяліла таксама шляхта, якая раней мела нямецкае культурнае аблічча. Польская культура і мова ператварыліся ў прыкмету мясцовых эліт, паколькі самая заможная і адукаваная частка насельніцтва была прадстаўленая людзьмі, выхаванымі ў польскай культуры. Невыпадкова ў польскамоўнай літаратуры за Латгаліяй замацавалася гістарычная назва – Польскія Інфлянты (пол.: *Inflanty Polskie*). Польскага культурнага дамінавання не спынілі нават падзелы Рэчы Паспалітай і ўключэнне Латгаліі ў склад Расіі ў 1772 годзе. Пра гэта сведчыць удзел мясцовай шляхты з нямецкім радаводам у нацыянальна-вызваленчых паўстаннях XIX ст. Праўда, за адданасць ідэям Рэчы Паспалітай мясцовая эліта заплаціла вялікую цану. Пасля здушэння паўстанняў 1830–1831 і 1863–1864 гг. царскія ўлады ўзмацнілі палітыку пераследу польскіх уплываў: былі зачыненыя польскія школы, пачаліся рэпрэсіі супраць мясцовай шляхты і Каталіцкай царквы[4].

Паланізацыя, характэрная для эліт, амаль не закранула ніжэйшыя слаі грамадства. У асяроддзі сялянства ішлі іншыя этнакультурныя працэсы. Блізкае суседства і актыўныя сацыяльна-гаспадарчыя сувязі жыхароў Латгаліі з усходнеславянскім абшарам спрыялі частковай моўнай асіміляцыі. Працэс славянізацыі быў павольны, але паслядоўна і няспынна ішоў некалькі стагоддзяў. Яму спрыялі культурна-палітычныя і эканамічныя працэсы, якія назіраліся ў Латгаліі і на беларускіх землях. Некалькі соцень гадоў яны існавалі ў межах адной дзяржаўнай прасторы (Полацкае княства, Вялікае Княства Літоўскае, Рэч Паспалітая, Расійская Імперыя). У выніку як беларускае, так і латгальскае сялянства мела тыя самыя клопаты і цяжкасці, а мовай зносін паміж імі былі беларускія гаворкі. Знаўца моўных спраў Янка Станкевіч наступным чынам характарызаваў беларуска-латгальскае падабенства лёсаў: "*Спрадвечнае суседства з беларускім народам, гаспадарча-культурныя сувязі ды колькісотгадовае сужыццё ў аднолькавых палітычна-дзяржаўных умовах, склаліся на тое, што да Першае сусветнае вайны сацыяльная структура, зямельная гаспадарка й быт латгальцаў былі ў істоце аднолькавымі як беларусаў суседняе Полаччыны ды паўночнае Віленшчыны: тыя самыя багатыя вялікімі абшарамі зямлі двары ды побач невялікія сялянскія вёскі, тая самая земляробская сістэма трыпалёўкі, тыя самыя гаспадарскія пабудовы. Гаспадарка краю была чыста аграрная, з мінімальнай індустрыяй і зачаткамі толькі ўрбанізацыі*"[5].

---

[4] P. Eberhardt, *Polska ludność kresowa: rodowód, liczebność, rozmieszczenie,* Warszawa 1998, s. 138.

[5] А. Багровіч, *Латгальцы – спрадвечныя суседзі*, "Запісы БІНіМ" 1976, т. 14, с. 68–69.

Славянізацыі мясцовага латгальскага насельніцтва спрыялі сацыяльна-эканамічныя і палітычныя падзеі XIX ст. У 1802 г. была створана Віцебская губерня, у складзе якой, апроч Віцебшчыны, апынулася Латгалія. На тэрыторыі апошняй былі наступныя паветы (рус.: *уезды*): Даўгаўпілскі, Лудзенскі і Рэжыцкі. Галоўным чынам славянізацыя тычылася часткі жахароў памежных з Беларуссю паветаў – Даўгаўпілскага і Лудзенскага, а таксама часткова Рэжыцкага. На дынаміку асіміляцыі ўплывала міграцыя насельніцтва ў гарады. У той перыяд асіміляцыю належыць разглядаць як беларусізацыю, бо на той час фанетычныя і лексічныя асабівасці беларускай мовы былі цалкам сфарміраваныя. На мяжы XIX і XX ст.ст. частка тутэйшага сялянства, якое мела латгальскае паходжанне, размаўляла па-беларуску, што знаходзіць пацвярджэнне ў працах тагачасных даследчыкаў гісторыі і культуры рэгіёну. Вядомы польскі сацыёлаг, які паходзіў з беларуска-літоўска-латышскага памежжа, Баляслаў Ліманоўскі, згадваў, што ў 1840-я гг. у навакольных вёсках "*сяляне былі латышамі, але беларуская мова ўжо пашырылася сярод іх. У часах майго дзяцінства старыя гутарылі яшчэ па-латышску, але моладзь ужо размаўляла па-беларуску*"[6]. Тым часам, выдатны польскі знаўца гісторыі Інфлянтаў Густаў Мантойфель пісаў пра мясцовых "русінаў". Гэтую назву ён выкарыстоўваў у дачыненні да беларускамоўнага латгальскага сялянства каталіцкага веравызнання: "*Русіны знаходзяцца толькі на памежжы Себежскага і Дрысенскага павета, а менавіта ў добрах Ландскрона, Пасіен і іх ваколіцах. У большасці яны рыма-каталіцкага вервызнання; толькі тыя, якія былі раней грэка-ўніятамі, у чацвёртай дэкадзе гэтага стагоддзя былі пераведзеныя ў праваслаўе. Русіны каталікі сваёй асветай і гарлівасцю ў веры абавязаныя ордэну айцоў дамініканаў*"[7]. Этнограф Аляксандр Рыціх у 1867 г. звяртаў увагу на прысутнасць беларусаў не толькі ў Латгаліі, але таксама ў іншых частках Латвіі, у тым ліку – у Фрыдрыхштацкім (пазней Якабпілскім) павеце. Пры гэтым аўтар падкрэсліваў, што на практыцы праваслаўных беларусаў складана адрозніць ад рускіх, а каталікоў – ад палякаў і літоўцаў[8].

Некаторыя сучасныя польскія даследчыкі сцвярджаюць, што беларуская мова была першай мовай многіх латгальскіх каталікоў. Сяляне карысталіся ёй у штодзённым жыцці, а польскую лічылі мовай вонкавых кантактаў і сакральнай сферы. Такім чынам, спрасціўшы, можна сказаць, што беларускамоўныя латгальскія каталікі ў хаце размаўлялі па-беларуску, але маліліся

---

[6] Ē. Jēkabsons, *Skład narodowościowy mieszkańców 6 gmin powiatu iłłukształńskiego w XIX–XX w. jako główny powód sporu terytorialnego między Łotwą a Polską w okresie międzywojennym* [w:] *Granice i pogranicza. Historia codzienności i doświadczeń*, t. I, red. Marzena Liedke, Joanna Sadowska, Jan Trynkowski, Białystok 1999, s. 226.

[7] G. Manteuffel, *Inflanty Polskie oraz Listy znad Bałtyku*, Kraków 2009, s. 56.

[8] M. Jankowiak, *Współczesne gwary białoruskie na Łotwie. Charakterystyka. Wybór tekstów*, Praha 2018, s. 25-26.

па-польску. Кшыштаф Заяс лічыць, што стэрэатыпнасць паняцця "каталік-паляк" у тагачаснай Латгаліі пацвярджае той факт, што падчас паўстання 1863–1864 гг. некаторыя сяляне-каталікі з імпэтам удзельнічалі ў паляванні на ацалелых паўстанцаў, якіх потым выдавалі ў рукі царскіх улад[9]. Уяўленне пра пашыранасць беларускіх гаворак у Латгаліі дае даследаванне Яўхіма Карскага, які ў 1903 г. лічыў, што найпаўночнейшыя абшары з беларускамоўным насельніцтвам знаходзяцца ў ваколіцах станцыі Карсава (*Kārsava*). Адначасова навуковец сцвярджаў, што шмат носьбітаў беларускіх гаворак пражывала ў Пасіенскай, Ландскаронскай, Істэрскай, Пустынскай, Прыдруйскай, Краслаўскай і шэрагу іншых валасцей Латгаліі[10]. Беларускамоўнасць славянізаваных латгальцаў пацвярджаюць таксама найноўшыя даследаванні. Даследчыкі-мовазнаўцы залічваюць беларускія гаворкі Латгаліі да паўночна-ўсходняга дыялекту беларускай мовы[11].

Наколькі шматлікай была беларускамоўная супольнасць Латгаліі паказвае ўрадавая статыстыка. Першыя спробы вызначыць этнічны склад Латгаліі былі зробленыя ў сярэдзіне XIX ст. На падставе звестак Віцебскага статыстычнага камітэта можна меркаваць, што ў трох "латгальскіх" паветах Віцебскай губерні жылі тады 39 834 беларусы (13,4% ад колькасці жыхароў паветаў), з іх праваслаўнымі былі 33 027, а каталікамі – 6 807. У раскладзе на асобныя паветы гэтыя лічбы выглядаюць наступным чынам: у Лудзенскім – 14 031 (20,6%), у тым ліку 4 268 каталікі (6,2%) і 9 763 праваслаўныя (14,3%); у Даўгаўпілскім – 9 617 (6,9%), у тым ліку 2 094 каталікі (1,5%) і 7 523 праваслаўныя (5,4%); у Рэжыцкім – 16 186 (18%), сярод іх было 445 каталікоў (0,4%) і 15 741 праваслаўны (17,6%). Беларускамоўнае насельніцтва колькасна саступала на Даўгаўпілшчыне латышам (латгальцам), рускім стараверам і габрэям, на Рэжыччыне – латышам і стараверам, а на Лудзеншчыне – толькі латышам[12]. Найбольш даступнай і поўнай крыніцай інфармацыі пра колькасць латвійскіх беларусафонаў на мяжы XIX і XX ст.ст. з'яўляюцца вынікі першага ўсерасійскага перапісу насельніцтва 1897 г., падчас якога браўся пад увагу менавіта моўны крытэрый. Варта падаць поўныя вынікі гэтага перапісу, якія тычацца моўнай сітуацыі.

---

[9] K. Zajas, *Nieobecna kultura. Przypadek Inflant Polskich,* Kraków 2008, s. 153.

[10] Н. Голубева, *Беларусы ў Латвіі* [у:] *Беларускае замежжа*, рэд. Н. Голубева, Менск 2010, с. 193.

[11] Гл.: M. Jankowiak, *Gwary białoruskie na Łotwie w rejonie krasławskim: studium socjolingwistyczne*, Warszawa 2009; Ibidem, *Współczesne gwary białoruskie na Łotwie. Charakterystyka. Wybór tekstów*, Praha 2018, s. 30.

[12] A. Tichomirow, *Struktura wyznaniowa i etniczna guberni witebskiej w pierwszej połowie lat 60. XIX wieku* [w:] *Problemy świadomości narodowej ludności polskiej na Białorusi, materiały III międzynarodowej konferencji naukowej, Grodno, 22–24 listopada 2004*, red. Eugeniusz Skrobocki, Grodno 2005, s. 165–182.

Табліца 1. Моўная структура "латвійскіх" губерняў паводле вынікаў усерасійскага перапісу 1897 г.

Lp.	Правіцыя	Колькасць насельніцтва, тыс.	Мовы															
			Латышская		Нямецкая		Руская		Ідыш		Польская		Беларуская		Літоўская		Інш.	
			у тыс.	у %	у тыс.	у %	у тыс.	у %	у тыс.	у %	у тыс.	у %	у тыс.	у %	у тыс.	у %	у тыс..	у %
1.	Відзэмэ	753,7	558,8	74,1	81,3	10.8	51,1	6,8	21,1	2,8	14,5	1,9	**0,8**	**0,1**	6,6	0,9	19,5	2,6
2.	Земгалія	334,2	240,3	71,9	19,2	5,7	17,1	5,1	21,3	6,4	13,1	3,9	**12,0**	**3,6**	9,7	2,9	1,5	0,5
3.	Курляндыя	339,8	265,8	78,2	31,8	9.3	8,6	2,5	16,3	4,8	6,7	2,0	**0,5**	**0,2**	6,7	2,0	3,4	1,0
4.	Латгалія	501,6	253,7	50,6	4,7	0,9	77,9	15,5	63,9	12,7	30,9	6,2	**66,4**	**13,2**	1,4	0,3	2,7	0,6
Агулам:		1929,3	1318,6	68,3	137,9	7,1	154,7	8,0	122,6	6,4	65,2	3,4	**79,7**	**4,1**	24,4	1,3	27,1	1,4

Крыніца: P. Eberhardt, *Problematyka narodowościowa Łotwy,* "Zeszyty IGiPZ", № 54 (Warszawa 1998), s. 13.

Перапіс прадэманстраваў, што ў Латгаліі латышскамоўныя асобы складалі толькі крыху больш за палову жыхароў (50,6%)[13]. Адной з галоўных прычын – разам з міграцыйнымі рухамі – быў асіміляцыйны працэс, вынікам якога стала страта значнай часткай латгальскага грамадства сваёй мовы на карысць славянскіх, перадусім беларускай. З перапісу вынікае, што носьбітаў беларускай мовы ў Латгаліі было 66,4 тыс. (13,2%). Агульная колькасць "моўных" беларусаў ва ўсіх частках Латвіі налічвала 79,4 тыс. (4,1% насельніцтва)[14]. Парадаксальна, але захаванне і пашырэнне беларускай мовы было магчыма дзякуючы нізкаму ўзроўню сацыяльнай камунікацыі ў XIX ст., які, паводле чэшскага даследчыка нацыяналізмаў Міраслава Гроха, "выратаваў беларускую вёску ад асіміляцыі ці ў выглядзе русіфікацыі, ці ў выглядзе паланізацыі"[15].

Варта прааналізаваць колькасць беларускамоўных жыхароў Латгаліі ў асобных паветах.

З табліцы вынікае, што найбольшым працэнтам "моўных" беларусаў адзначаліся два паветы: Даўгаўпілскі – 32,7 тыс. (13,8%) і Лудзенскі – 26,3 тыс. (20,5%). Пры гэтым на Даўгаўпілшчыне беларусафоны саступалі колькасна толькі латышам і, нязначна, рускім і габрэям. На Лудзеншчыне – знаходзіліся на другім месцы пасля носьбітаў латышскай мовы. У той самы час адносна

[13] У трох астатніх правінцыях Латавіі латышы складалі абсалютную большасць: 74,1% у Ліфляндыі, 72% у Земгаліі, 78,2% у Курляндыі.

[14] P. Eberhardt, *Problematyka narodowościowa Łotwy*, "Zeszyty IGiPZ", № 54 (Warszawa 1998), s. 11.

[15] М. Грох, *Нацыя як прадукт сацыяльнай камунікацыі? (да праблемы параўнання чэшскай і беларускай "мадэлей" нацыянальнага Адраджэння)*, "Гістарычны альманах" 2006, т. 12, с. 16.

Табліца 2. Моўная структура трох паветаў Латгаліі паводле вынікаў усерасійскага перапісу 1897 г.

Lp.	Павет	Агулам	Мовы															
			Латышская		Нямецкая		Руская		Ідыш		Польская		Беларуская		Літоўская		Інш.	
			у тыс.	у %	у тыс.	у %	у тыс.	у %	у тыс.	у %	у тыс.	у %	у тыс.	у %	у тыс.	у %	у тыс.	у %
1.	Рэжыкнэ	136 4	78,9	57,8	0,4	0,3	32,6	23,9	10,1	7,4	6,5	4,8	**7,4**	**5,4**	0,2	0,1	0,3	0,3
2.	Даўгаўпілс	237,0	92,5	39,0	4,0	1,7	36,1	15,2	47,5	20,0	21,6	9,1	**32,7**	**13,8**	0,9	0,5	1,7	0,7
3.	Лудза	128,2	82,3	64,2	0,3	0,2	9,2	7,2	6,3	4,9	2,8	2,2	**26,3**	**20,5**	0,3	0,2	0,7	0,6

Крыніца: P. Eberhardt, *Problematyka narodowościowa Łotwy,* "Zeszyty IGiPZ", № 54 (Warszawa 1998), s. 11.

няшмат носьбітаў беларускай мовы пражывала ў Рэжыцкім павеце – 7,4 тыс. (5,4%), дзе яны саступалі колькасна латышам і рускім. Цягам наступным гадоў суадносіны паміж беларускамоўнымі і латышскамоўнымі (ці латгальскамоўнымі) жыхарамі не памяняліся на карысць апошніх. У лютым 1920 г. у латвійскай прэсе адзначалася, што насельніцтва ўсходніх ускраін Дрысы настолькі асімілявалася, што "*частка цяперашніх латгальцаў на беларускай мяжы ператварылася ў нявызначаную масу этнаграфічнага матэрыялу, мова якога ўяўляе нявызначаную сумесь латышскай, рускай і беларускай моваў. Сістэматычная культурная праца можа гэту масу ў непрацяглы час ператварыць у латышоў, рускіх ці беларусаў*"[16]. Побач з носьбітамі беларускіх гаворак каталіцкага і праваслаўнага веравызнанняў знаходзіліся месцы кампактнага пражывання стараверaў і лютэранаў. У Рэжыцкім і Лудзенскім паветах наслаіліся ажно тры этнічныя арэалы. З паўднёвага ўсходу сюды пранікала праваслаўе і часткова беларускамоўныя каталікі. На поўдні знаходзіўся польскамоўны абшар. У паўночных рэгіёнах пераважала каталіцкае насельніцтва, якое размаўляла па-латышску. Больш за тое, арэалы пашырэння беларускай, польскай і латышскай (латгальскай) моваў не былі замкнёныя і нярэдка ўтваралі такую цераспалосіцу, што складана было вызначыць этнічны характар той ці іншай воласці[17].

Такім чынам, прысутнасць беларускамоўных аўтахтонаў у Латгаліі на пачатку XX стагоддзя не выклікае сумневу. Аднак прыналежнасць да беларускамоўнай групы не дае падстаў залічваць усіх яе прадстаўнікоў да беларусаў паводле нацыянальнасці. Сярод беларускамоўных латгальцаў, як і сярод

[16] Eesti Rahvusarhiiv (ERA), f. 957, n. 11, s. 259, l. 9.

[17] P. Eberhardt, *Problematyka narodowościowa Łotwy*, "Zeszyty IGiPZ", № 54 (Warszawa 1998), s. 24.

жыхароў Беларусі, у разгляданы час яшчэ не сфарміравалася ўсведамленне нацыянальнай адметнасці ад суседзяў. Знаўца нацыятворчых працэсаў у Цэнтральна-Усходняй Еўропе Міраслаў Грох лічыць, што адбывалася гэта з тае прычыны, што ўласную адметнасць лягчэй усведамляюць тыя этнічныя групы, чые мовы выразна адрозніваюцца ад суседніх. У выпадку беларусаў мовы суседзяў – рускіх і палякаў – былі зразумелымі[18].

Варта больш уважліва разгледзець пытанне нацыянальнай самаідэнтыфікацыі беларускамоўных жыхароў Латгаліі. Падчас перапісу 1897 г., пры вызначэнні нацыянальнасці/народнасці (абодва тэрміны выкарыстоўваліся царскімі ўрадоўцамі як сінонімы), у якасці крытэрыю бралася пад увагу мова насельніцтва, а не нацыянальная ідэнтычнасць. Пры гэтым звесткі пра родную мову сялян вызначалі перапісныя камісары. У сувязі з гэтым вынікі перапісу адлюстроўваюць перадусім моўную структуру, а не нацыянальную. Такім чынам, перапіс не дае адказу на пытанне, колькі жыхароў Латгаліі лічыла сябе беларусамі і які змест яны ўкладалі ў гэтую назву. На самай справе асобы, запісаныя беларусамі, нярэдка ўвогуле не мелі ніякай нацыянальнай ідэнтычнасці. Пры канцы XIX – на пачатку XX ст. нацыянальная самасвядомасць латгальскай вёскі знаходзілася яшчэ ў стадыі фарміравання. Мясцовыя сяляне былі трывала звязаныя са сваім рэгіёнам і сваёй ("тутэйшай") культурай, але не заўсёды ўсведамлялі сябе часткай нечага большага. Вось якім чынам бачыў беларускамоўных жыхароў Латвіі К. Езавітаў: "*Да 1921 года нацыянальная свядомасць беларускай людносці ў Латвіі была вельмі слабая: большасць беларусаў называла сябе проста 'тутэйшыя', калі ж беларускую жанчыну, або хлапца пачыналі пытаць, да якой яны належаць нацыянальнасці, дык яны не ведалі нават што і адказаць*"[19].

На мяжы XIX і XX ст.ст. стварыліся перадумовы для таго, каб мясцовае сялянства набывала нацыянальную свядомасць. Пад уплывам паступовага раскладання традыцыйнага грамадства, прамысловага ўздыму і развіцця капіталістычных адносін, а таксама ўсё большай актыўнасці нацыянальных рухаў (польскага, латышскага, беларускага і г.д.) сялянскія масы апынуліся перад абліччам своеасаблівага крызісу ідэнтычнасці. Повязі традыцыйнага вясковага патрыманіяльнага грамадства ў эпоху нацыяналізму і мадэрнізацыі аслаблі, і селянін мусіў шукаць новых каштоўнасцей і супольнасцей. Фарміраванне нацыянальнай свядомасці ў Латгаліі ўскладнялася тым, што рэгіён уяўляў сабой этнічную і канфесійную мазаіку. Межы моўных абшараў не супадалі з межамі абшараў рэлігійных. Этнічныя і канфесійныя групы жылі кампактна,

---

[18] М. Грох, *Нацыя як прадукт сацыяльнай камунікацыі? (да праблемы параўнання чэшскай і беларускай "мадэлей" нацыянальнага Адраджэння)*, "Гістарычны альманах" 2006, т. 12, с. 16–17.

[19] К. Езавітаў, *Беларуская нацыянальная меншасьць у Латвіі*, "Голас беларуса" 1929, № 2 ад 22 ліпеня, с. 2.

пранікаючы адна ў адну. Такім чынам, нацыянальная ідэнтычнасць латгальскай вёскі магла паступова эвалюцыянаваць не ў адным, а адразу ў некалькіх кірунках: польскасці, латышскасці, беларускасці, а нават рускасці.

Узяўшы пад увагу вышэйзгаданыя акалічнасці, цяжка дакладна вызначыць нацыянальны склад паўднёва-ўсходняй Латвіі ў разгляданы час. Ва ўмовах адсутнасці выкрышталізаванага пачуцця нацыянальнай тоеснасці істотную ролю падчас яго фарміравання адыгрывала веравызнанне. У сувязі з гэтым неабходна азнаёміцца з канфесійнай структурай латышска-беларускага памежжа.

Табліца 3. Канфесійная структура Латгаліі і Ілукшчыны ў 1897 г.

Lp.	Павет	Разам	Веравызнанне									
			Пратэстанты		Каталікі		Праваслаўныя		Іўдэі		Іншыя	
		у тыс.	у тыс.	у %	у тыс.	у %	у тыс.	у %	у тыс.	у %	у тыс.	у %
1.	Ілукшта	66,5	11,6	17,5	36,4	54.7	5,4	8,1	6,4	9,6	6,7	10,1
2.	Рэжыкнэ	136,4	2,6	1,9	87,3	64,0	4,6	3,4	10,2	7,5	31,7	23,2
3.	Даўгаўпілс	237,0	22,5	9,5	117,3	49,5	22,5	9,5	47,8	20,1	26,9	11,4
4.	Лудза	128,2	12,3	9,6	81,3	63,4	25,2	19,7	6,3	4,9	3,1	2,4

Крыніца: P. Eberhardt, *Problematyka narodowościowa Łotwy*, "Zeszyty IGiPZ", № 54 (Warszawa 1998), s. 17.

Такім чынам, бачна, што большасць жыхароў Латгаліі (у тым ліку беларускамоўных) спавядала каталіцтва, якое дамінавала ва ўсіх паветах. На тэрыторыі трох латгальскіх паветаў і суседняй Ілукшчыны пражывала 322,3 тыс. каталікоў, што складала большасць усіх вернікаў дадзенай канфесіі ў Латвіі. На культурным памежжы Каталіцкая царква ў разгляданы перыяд была носьбітам польскасці і польскай культуры. Галіна Турская, якая даследавала з'яўленне польскамоўных абшараў на суседняй з Латгаліяй Віленшчыне, параўноўвае польскамоўныя набажэнствы з навучаннем польскай мовы для літоўскага і беларускага сялянства. Галоўным фактарам набыцця мясцовымі сялянамі польскай ідэнтычнасці была прывабнасць польскай культуры ў вачах каталіцкага сялянства. Гэты працэс адбываўся добраахвотна і абумоўліваўся жаданнем сялян-каталікоў далучыцца да культуры, якая ўспрымалася як прыкмета прыналежнасці да вышэйшай сферы грамадства. Вызваленыя ад прыгону сяляне, дзякуючы адпаведнай эканамічнай сітуацыі, паляпшалі сваё матэрыяльнае становішча і імкнуліся да паляпшэння сацыяльнага статусу. Нават рэпрэсіі царскіх улад не былі ў стане стрымаць гэтае імкненне. Парадаксальна, але антыпольская палітыка расійскага царызму пасля паўстання 1863–1864 гг., якая распаўсюджвалася на ўсё каталіцкае жыхарства, спрыяла фарміраванню ў беларускамоўных каталікоў пачуцця прыналежнасці

да польскага народа. Праз навязаныя грамадству ўладамі вызначэнні "польская вера" і "руская вера" адбывалася ўсё большае атаясамліванне каталіцтва з польскасцю. Падтрымліваючы праваслаўе і выкарыстоўваючы рэпрэсіі супраць Каталіцкай царквы, расійскія ўлады штурхалі традыцыйнае і моцна прывязанае да рэлігійных каштоўнасцей беларускамоўнае каталіцкае сялянства ў абдымкі польскай культуры. Яшчэ Мітрафан Доўнар-Запольскі звярнуў увагу на тое, што паланізацыя з'яўляецца вынікам няўдалай палітыкі царскага ўрада, які не ведаў мясцовых рэалій і сваімі метадамі спрыяў самапаланізацыі каталіцкіх сялянскіх мас. Расійскія ўлады аўтаматычна лічылі ўсіх каталікоў палякамі. У сувязі з гэтым самі сяляне прызвычаіліся індэнтыфікаваць сябе менавіта такім чынам. Ва ўмовах узмацнення расійска-польскага грамадска-палітычнага і культурнага супрацьстаяння сялянства апынулася ў сітуацыі выбару паміж Расіяй і Польшчай. Сацыяльны і канфесійны прыгнёт спрычыніўся да з'яўлення ў сялян надзеі, што змены да лепшага могуць адбыцца толькі ў выніку адбудовы польскай дзяржавы[20].

Імаверна, што да сярэдзіны XX ст. свядомасць беларускамоўных каталікоў Латгаліі магла б цалкам набыць польскі нацыянальны характар, як гэта адбылося на Віленшчыне. Аднак гісторыя пайшла іншым шляхам, бо, па-першае, рэгіён знаходзіўся далёка ад буйных асяродкаў польскага культурнага жыцця (напрыклад, Вільні). Па-другое, у міжваенны час рэгіён быў пазбаўлены польскай арыстакратыі, прадстаўнікі якой у першыя гады існавання Латвійскай Рэспублікі выехалі ў Польшчу. Па-трэцяе, (гэта – на нашую думку – асноўная прычына), у адрозненні ад Віленскага краю, Латгалія ў міжваенны час апынулася па-за межамі польскай дзяржавы. Мясцовая польскасць не была пануючай нацыянальнай сілай, не карысталася падтрымкай дзяржавы. Яна трапіла ў становішча нацыянальнай меншасці, якая мусіла канкураваць "за душы і сэрцы" мясцовага маласвядомага сялянства з іншымі нацыянальнымі рухамі: перадусім – латышскім (латгальскім) і беларускім. Прысутнасць на латагальскім энтакультурным краявідзе польскай мовы і нацыянальнай свядомасці не мяняе таго, што значная частка тутэйшага насельніцтва па-ранейшаму не атаясамлівала сябе з якой-колечы нацыянальнай ідэнтычнасцю.

Кажучы пра фарміраванне беларускай ідэнтычнасці ў Латвіі, варта звярнуць увагу на яшчэ адзін рэгіён – Ілукштанскі павет Земгаліі, які ўваходзіў у склад Курляндскай губерні. У этнакультурным сэнсе гістарычны лёс гэтага рэгіёну нагадвае тое, што адбывалася ў суседняй Латгаліі. Праўда, тут захоўваліся мясцовыя асаблівасці, якія паўплывалі на фармаванне культурнага і этнічнага аблічча Ілукшчыны. У сувязі з тым, што павет належаў да

[20] А. Смалянчук, *Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях 1864–люты 1917 г.*, Санкт Пецярбург 2004, с. 18, 21, 24–25, 100–101.

Курляндскай губерні, тут не было вострых антыпольскіх рэстрыкцый, якія пасля паразы паўстання 1863–1864 гг. выкарыстоўваў царызм на іншых абшарах. Таму ў Ілукштанскі павет пераязджалі многія палякі з іншых частак Расійскай Імперыі, у тым ліку – Царства Польскага. Пад уплывам мясцовай польскамоўнай арыстакратыі частка сялян лютэранскага веравызнання прыняла каталіцтва, што наблізіла іх да польскай культуры. У XIX ст. на этнакультурным краявідзе Ілукшчыны адбыліся працэсы, якія цалкам змянілі аблічча гэтага рэгіёну. Яшчэ на пачатку стагоддзя ў павеце колькасна пераважалі пратэстанты, якія размаўлялі на дыялектах латышскай мовы, а пры канцы сітуацыя выглядала інакш. Паводле перапісу 1897 г. у Ілукштанскім павеце пражывала 66 тыс. чал., у тым ліку: 18 955 (28,6%) латышоў, 11 478 (17,2%) беларусаў, 11 380 (17,2%) палякаў, 1 082 (1,7%) немцаў, 10 121 (15,2%) рускіх, 6 986 (10,5%) літоўцаў, 6 351 (9,6%) габрэяў[21]. Вось якім чынам гэтыя змены характарызуе Эрыкс Екабсонс: "*Нават сярод жыхароў адной мясцовасці і людзей з аднолькавымі, несумненна латышскімі прозвішчамі, былі тыя, хто роднай мовай лічыў беларускую (найчасцей) альбо польскую. Сустракаліся таксама тыя, чыёй мовай з'яўлялася беларуская, але адзінай мовай, на якой маглі чытаць, была – латышская. Беларусаў, паводле перапісу, была большасць. Большасць іх належала да каталіцкага веравызнання, і, мяркуючы па ўсіх прыкметах, у рэальнасці яны былі альбо русіфікаванымі палякамі, альбо латышамі. Нават сярод паліцыянтаў Ілукшатнскага павета ў 1913 годзе былі два (...) ураджэнцы гэтага павета 'беларусы' (Бацан Крыш, сын Яна і Каралюн Ян, сын Адама) з латышскімі прозвішчамі, якія належалі да Лютэранскай царквы (!). Належыць адзначыць, што сярод паліцыянтаў большасць называла сябе беларусамі, нягледзячы на тое, што толькі частка з іх паходзіла з Беларусі, а яны былі каталікамі, праваслаўнымі і нават старавераміі (...) Асобы з латышскімі прозвішчамі сустракаліся таксама сярод палякаў (...), што сведчыць пра паланізацыйны працэс сярод латышоў-каталікоў, якія паходзілі з паветаў Латгаліі, яны былі значна менш адукаваныя і нацыянальна свядомыя за латышоў-лютэранаў*"[22].

Пра нацыянальную "няўстойлівасць" жыхароў Ілукшчыны сведчыць факт, што ўжо праз два дзесяцігоддзі пасля першага ўсерасійскага перапісу яе этнічны склад выглядаў інакш. У снежні 1919 г. польскія ўлады, якія часова занялі павет, правялі перапіс насельніцтва. Паводле яго вынікаў,

---

[21] P. Eberhardt, *Problematyka narodowościowa Łotwy*, "Zeszyty IGiPZ", № 54 (Warszawa 1998), s. 11.

[22] Ē. Jēkabsons, *Skład narodowościowy mieszkańców 6 gmin powiatu iłłuksztańskiego w XIX–XX w. jako główny powód sporu terytorialnego między Łotwą a Polską w okresie międzywojennym* [w:] *Granice i pogranicza. Historia codzienności i doświadczeń*, t. I, red. Marzena Liedke, Joanna Sadowska, Jan Trynkowski, Białystok 1999, s. 226–229.

у шасці валасцях Ілукштанскага павета жыло 17 630 чал., з якіх 9 207 былі запісаныя палякамі, 5 068 рускімі, 1 396 латышамі, 1 273 беларусамі, 251 літоўцамі, 134 габрэямі, 31 асобамі іншай нацыянальнасці. Параўнанне вынікаў двух перапісаў паказвае, што асноўныя змены колькаснай вагі тычыліся беларусаў. Можна зрабіць выснову, што ў гэтых двух выпадках перапісчыкі карысталіся рознымі прыкметамі: рускія ўлады – моўнай, а польскія – канфесійнай. У 1919 г. польскія ўлады на патрэбы бягучай палітыкі (быў разлік, што Ілукшчына апынецца ў складзе польскай дзяржавы), падчас вызначэння нацыянальнага складу павета, узялі за аснову канфесійны фактар. Каталіцкае веравызнанне разглядалася як доказ прыналежнасці да польскай нацыянальнасці. Маніпуляцыі з боку тых, хто праводзіў перапісы, былі магчымыя з прычыны нацыянальнай несвядомасці мясцовага сялянства. Было нескладана прымусіць тубыльцаў заявіць патрэбную перапісчыкам нацыянальнасць. Аналіз статыстычных звестак дазваляе сцвярджаць, што ўлады маніпулявалі настроямі людзей, якія ў паўсядзённым жыцці размаўлялі мяшанкай розных моваў і дыялектаў. Неадукаваныя сяляне на пытанне пра іх нацыянальнасць часцей за ўсё адказвалі, што з'яўляюцца каталікамі альбо належаць да "польскай веры". Нярэдка таксама яны адказвалі, што з'яўляюцца "тутэйшымі". Латвійскія публіцысты яшчэ ў 1939 г. у дачыненні да гэтых жыхароў Ілукшчыны выкарыстоўваў назву "*мухаброды*" маючы на ўвазе людзей, якія ў этнакультурным сэнсе былі найбліжэй да беларусаў[23].

Зараз варта звярнуць увагу на групу беларусаў, якія не належалі да аўтахтоннага насельніцтва Латвіі, але апынулася на яе тэрыторыі ў выніку палітычных і сацыяльна-эканамічных працэсаў. Многія беларускія сяляне Віцебшчыны кіраваліся ў Балтыю, уцякаючы ад голаду і панскага прыгнёту. Міграцыя з Беларусі на тэрыторыю сённяшняй Латвіі павялічылася пасля скасавання прыгоннага права ў 1861 г., бо прыгон абмяжоўваў міграцыйныя магчымасці сялян. У другой палове XIX ст. была пабудаваная чыгунка паміж Віцебскам і Даўгаўпілсам. Вышэйзгаданыя падзеі ажывілі ўнутраную міграцыю жыхароў абшару паміж гарадамі. Чыгунка, якая звязвала Рыгу з Арлом і Ліепаю (Лібаву) з Ромнам, праходзіла праз беларускія землі. У партовых гарадах і на чыгунцы з'явіўся попыт на працоўную сілу. Рыга, Ліепая і Даўгаўпілс прыцягвалі насельніцтва беларускіх губерняў[24]. Там беларусы апынуліся ў касмапалітычным шматнацыянальным і шматмоўным асяроддзі, якое спрыяла іх асіміляцыі з рускай альбо польскай (у залежнасці ад канфесійнай прыналежнасці) культурай. Разам з тым, былыя вяскоўцы захоўвалі

[23] Ibidem, s. 229–230.

[24] У 1883 г. у сям'і работніка ў Ліепаі нарадзіўся Іван Фёдараў (літаратурны псеўданім: Янка Маўр), будучы беларускі дзіцячы пісьменнік.

некаторыя свае народныя абрады і звычаі, што яшчэ адрознівала іх ад рускіх і палякаў. Цікавае сведчанне пакінуў К. Езавітаў, які апісваў беларускую прысутнасць у горадзе на пачатку XX стагоддзя: "*Штогодны наплыў у Дзвінск новых выхадцаў з беларускіх вёсак і цесная сувязь тых, што раней з'явіліся, са сваёй вясковай раднёй, рабілі тое, што беларускае жыхарства ў горадзе не траціла сваіх нацыянальных звычаяў і свайго беларускага твару. Праўда, уплывы расейскай школы, адміністрацыі й праваслаўнай царквы рабілі некаторы вонкавы налёт на беларусаў-праваслаўных, заахвочваючы іх да карыстання з расейскае мовы, а ўплывы касцёлу й сукрытых польскіх школаў пры іх, дзе навучалі малітваў і чытанняў у польскай мове, прывучалі беларусаў-каталікоў да мовы польскае, але гэтыя з'явы мелі толькі вонкавы характар, закраналі толькі мову й не мелі глыбейшых уплываў на звычаі, характар, народныя вераванні і абрады, якія заставаліся непарушнымі й свята выконваліся, як выконваліся яны й на беларускіх вёсках (...) Найбольш станоўка адчувалася беларуская стыхія ў прадмесцях Дзвінску, а найбольш выразна й моцна кідалася ў вочы назіральніка падчас калядных 'святых вечароў'. Ужо за тыдзень-два да Калядаў хлапцы й дзяўчаты дзвінскіх прадмесцяў распачыналі падрыхтоўку да сваіх калядных выступленняў: складаліся гурткі па 10–12 чалавек, падрыхтоўваліся вопраткі, паўторваліся й нанова вывучаліся ролі й харавыя калядныя спевы, ладзілася 'звязда' ('зорка'), галава 'казы', 'жураўля' й 'кабылы', складаліся спісы, да каго ў які дзень і якая група пойдзе, каб не зайсці часам у чужы раён і не мець потым непрыемнасцяў і з гаспадарамі хаты, і з ваколічнымі калядоўшчыкамі іншае групы (...) Цвёрды быт дзвінчукоў быў парушаны I-ю Усясьветнаю вайной, калі ў 1915 годзе з Дзвінску былі эвакуяваныя розныя ўстановы й калі тысячы жыхароў былі вывезеныя. Было ўжо не да святкаванняў, дый няма каму было святкаваць, бо сем'і былі расцярушаныя й параскіданыя па ўсёй Расеі. Калі вайна скончылася і ў Дзвінск пачалі вяртацца эвакуяваныя сямейкі, дужа многа беларусаў гэтак і не вярнулася зусім*"[25].

Асобна варта звярнуць увагу на настаўнікаў, якія, атрымаўшы педагагічную адукацыю, былі размеркаваныя ў мястэчкі і вёскі Латгаліі. Большасць з іх складалі выхадцы з Віцебшчыны і Полаччыны, з праваслаўнага сялянства і дробнага мяшчанства. Гэтыя людзі, скіраваныя царскімі ўладамі ў латгальскія раёны Віцебскай губерні, праз рэлігію і выхаванне ў духу аддонасці расійскай дзяржаве былі моцна зрусіфікаваныя. Разам з тым, адчувалі сваю адрознасць ад рускіх, але прыналежнасць да беларускасці разглядалі ў катэгорыях рэгіяналізму (у духу ідэй заходнерусізму). Трапна дадзеную

[25] К. Езавітаў, *Каляды ў Дзьвінску сорак год таму*, "Новы Шлях" 1943, № 24; перадрук: *Крывіцкія руны. Вып. II: Беларускі культурны мацярык у Латвіі*, рэд. М. Казлоўскі, С. Панізнік, Менск 2017, с. 39–45.

групу характарызаваў К. Езавітаў, які пісаў: "*Праваслаўная беларуская інтэлігенцыя па гарадох і мястэчках, прайшоўшая ў свой час расейскую школу і пабываўшая ў расейскім войску і ў расейскіх канцылярыях, вельмі абмаскалілася. Гэтая частка беларускае інтэлігенцыі, часта-густа прызнаючы сябе за прыродных беларусаў-крывічоў, усё яшчэ па старой прывычцы цягне ў бок расейшчыны і вельмі раўнадушна ставіцца да ідэі беларускага нацыянальна-сацыяльнага адраджэння*"[26]. Аднак менавіта сярод гэтай групы людзей належыць шукаць тых, што ў адпаведных грамадска-палітычных умовах былі гатовыя прыняць беларускую нацыянальную ідэнтычнасць і стаць першымі прадстаўнікамі мясцовай беларускай інтэлігенцыі, пра што будзе гаворка ў наступным раздзеле кнігі[27].

Калі казаць пра беларусаў з ліку неаўтахтонаў латвійскай зямлі, варта таксама згадаць пра вайскоўцаў Рускай імператарскай арміі, якія на мяжы XIX–XX ст.ст. кватараваліся ў мясцовых гарнізонах. Значная колькасць рускіх войскаў знаходзілася ў Даўгаўпілскай крэпасці (пабудавана ў 1833 г.). У яе мурах служылі вайскоўцы-беларусы, вызначыць дакладную колькасць якіх немагчыма. Знаходжанне вайскоўцаў у Даўгаўпілсе мела ратацыйны характар, таму іх прысутнасць не паўплывала істотным чынам на ідэнтычнасць і самаарганізацыю латгальскіх беларусаў. Заслугоўвае ўвагі, што ў лістападзе 1893 г. у Даўгаўпілскай крэпасці нарадзіўся Кастусь Езавітаў. Яго бацька – Барыс Ануфрыевіч Езавітаў – быў падафіцэрам 100-га Астроўскага пяхотнага палка (пазней заўрад-прапаршчыкам 97-га Ліфлянцкага пяхотнага палка) 25-й пяхотнай дывізіі[28].

Падводзячы высновы наконт носьбітаў беларускай культуры ў Латвіі да пачатку XX ст., належыць падкрэсліць, што ў асноўным яна была прадстаўленая аўтахтонным насельніцтвам беларуска-латвійскага памежжа, якое з'явілася на мясцовым этнанацыянальным краявідзе ў выніку складаных гістарычных працэсаў. Апошнія адбываліся на працягу стагоддзяў набываючы дынаміку і выразны кшталт на мяжы XIX і XX ст.ст. У жылах мясцовых беларусафонаў плыла кроў балцкіх (латгальскіх) прашчураў, якія пад уплывам славянскіх суседзяў прынялі беларускую мову і культуру. У сувязі з гэтым трэба лічыць міфам папулярнае сярод беларускіх дзеячаў Латвіі ў міжваенны час меркаванне, што латвійскія беларусы – нашчадкі полацкіх крывічоў. На пачатку XX ст. частка латгальскага насельніцтва ўжо размаўляла па-беларуску, але яшчэ мела праблемы з нацыянальнай самаідэнтыфікацыяй. У Латвіі праявіліся працэсы, уласцівыя іншым рэгіёнам, дзе пражы-

[26] К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, Рыга 1926, с. 40.

[27] Сярод дадзенай катэгорыі людзей можна ўзгадаць Сяргея і Вольгу Сахаравых, Яна Харлапа, Янку Шчорса, Сцяпана Сіцько, Міхася Іванова, Астапа Хруцкага і інш.

[28] Российский государственный военный архив (РГВА), ф. 2765, оп. 2, д. 358, л. 1.

вала беларускамоўнае насельніцтва. Мясцовыя беларусы былі пазбаўленыя ўласных кіроўных эліт, а асноўнымі носьбітамі беларускай мовы і культуры з'яўляліся сяляне. Яны не адчувалі сваёй адметнасці, а ўласную ідэнтычнасць вызначалі на падставе сувязі з "малой айчынай" (рэгіёнам пражывання), лічылі сябе "тутэйшымі". Родную мову, якая не мела высокага сацыяльнага статусу, называлі "простай".

На фарміраванне ідэнтычнасці беларускамоўнай латгальскай вёскі ўплываў канфесійны фактар. Беларускамоўныя жыхары праваслаўнага веравызнання не прынялі рускай нацыянальнай ідэнтычнасці нягледзячы на прыналежнасць да рускай праваслаўнай арганізацыі. Такім чынам, яны – не толькі ў Латгаліі, але і на ўсім беларускім этнаграфічным абшары – былі першымі кандыдатамі на прыняццё беларускай ідэнтычнасці. На перыферыях гэтага абшару, дзе сутыкаліся праваслаўе і каталіцтва, першае рабілася сінонімам беларускасці[29]. Тым часам свядомасць беларускамоўных каталікоў паступова эвалюцыянавала ў бок польскасці. Гісторыя паказвае, што большасць беларускамоўных каталікоў Віленшчыны, Беласточчыны і Гарадзеншчышы на пачатку XX ст. набыла польскую нацыянальную свядомасць. З вялікай ступенню верагоднасці іх лёс маглі падзяліць і латгальскія беларусафоны, паколькі атаясамленне каталіцкасці з польскасцю ў штодзённым уяўленні мясцовага насельніцтва было моцным. Акрамя таго, паланізацыі каталікоў спрыяла царская палітыка, якая ў каталіках бачыла палякаў[30]. Аднак гісторыя пайшла іншым шляхам. У міжваенны час латгальскае каталіцтва было пазбаўлена моцнай інстытуцыянальнай польскай падтрымкі, што давала большую магчымасць для фарміравання няпольскай ідэнтычнасці вернікаў. У выніку выбар мясцовых каталікоў на карысць польскай нацыянальнай ідэнтычнасці не быў тут такі відавочны.

У XX стагоддзе латагальскія "моўныя" беларусы ўваходзілі як этнаграфічны матэрыял, які мог паслужыць да фарміравання цэлага шэрагу мадэрных нацыянальных ідэнтычнасцей: беларускай, польскай, рускай, латвійскай (латгальскай). Вынік мясцовага нацыятворчага праекту залежаў ад актыўнасці і жывучасці нацыянальных рухаў вышэйзгаданых народаў. На пачатку XX ст. беларускамоўныя латгальцы сталі натуральным аб'ектам культурнай і палітычнай экспансіі нацыянальных рухаў. Менавіта пад уплывам іх дзейнасці ў наступныя гады і дзесяцігоддзі фарміравалася нацыяна-

---

[29] A. Mironowicz, *Wpływ wyznań religijnych na kształtowanie się białoruskiej świadomości narodowej w XIX wieku* [w:] *Tożsamość białoruska: doświadczenia przeszłości i wyzwania teraźniejszości. W 30. rocznicę uzyskania przez Białoruś niepodległości*, red. J. Getka, J. Grzybowski, Warszawa 2021, s. 40.

[30] P. Eberhardt, *Polska ludność kresowa: rodowód, liczebność, rozmieszczenie,* Warszawa 1998, s. 48–49.

льная свядомасць "тутэйшых" на беларуска-латвійскім памежжы. У сувязі з гэтым належыць пагадзіцца з Кшыштафам Заясам, што дэкларованне латгальскімі жыхарамі той ці іншай нацыянальнасці было з'явай прымусу з боку знешніх сіл[31].

Пачаткі беларускага руху ў Латвіі (да сярэдзіны 1919 г.)

Беларускае нацыянальнае адраджэнне пачалося пазней у параўнанні з адраджэннем у суседніх народаў (літоўцаў, латышоў, украінцаў). Адбылося гэта па аб'ектыўных прычынах, абумоўленых складаным гістарычным і сацыяльна-эканамічным развіццём беларускіх зямель[32]. Тым не менш, беларусы не засталіся на ўзбоччы нацыятворчых працэсаў, якія назіраліся ў Цэнтральна-Усходняй Еўропе на мяжы XIX і XX ст.ст. У першым дзесяцігоддзі XX ст. з'явіліся першыя прыкметы беларускага нацыянальнага руху. Аднак Латвія знаходзілася на перыферыі беларускага адраджэння. Нягледзячы на гэта, першыя праявы беларускага нацыянальнага жыцця на латвійскай зямлі можна было заўважыць ужо ў першыя гады нараджэння беларускага руху. Спрычыніўся да гэтага сацыяльна-эканамічныя фактар. Рыга была адным з найбуйнейшых і найбольш прамыслова развітых гарадоў імперыі Раманавых. Горад быў і буйным інтэлектуальным цэнтрам. Невыпадкова, што ён вабіў жыхароў розных куткоў еўрапейскай часткі Расійскай Імперыі. Напрыканцы XIX і на пачатку XX ст.ст. у Рызе апынуліся такія беларускія дзеячы, які Браніслаў Эпімах-Шыпіла (ён скончыў тутэйшую гімназію), Аляксандр Уласаў (скончыў Рыжскую політэхніку) і Зміцер Жылуновіч (нейкі час працаваў гарбаром). Тут пабывалі Іван Луцкевіч, Мікола Вяршынін, Эдвард Будзька і інш. На нейкі час лёс закінуў сюды Вацлава Ластоўскага, які зрабіў у Рызе няўдалую спробу атрымаць атэстат сталасці[33]. Прысутнасць гэтых асоб у будучай сталіцы Латвіі не пакінула, аднак, істотнага следу ў гісторыі мясцовага беларускага руху.

Рэвалюцыйныя падзеі ў Расійскай Імперыі ў 1905–1907 гг. прыспешылі працэс нацыянальнага адраджэння нярускіх народаў, у тым ліку беларусаў. У гэты час праявы беларускага жыцця не абмінулі таксама і Латвіі. Сюды траплялі першыя беларускія перыядычныя выданні – "Наша доля" і "Наша

---

[31] K. Zajas, *Nieobecna kultura. Przypadek Inflant Polskich*, Kraków 2008, s. 150.

[32] П. Терешкович, *Этническая история Беларуси XIX – начала XX в. в контексте центрально-восточной Европы*, Минск 2004, с. 198.

[33] А. Вабішчэвіч, *"Але ж шлях да свабоды старонка праложа!"* [у:] *Сыны і пасынкі Беларусі*, рэд. С. Барыс, Менск 1996, с. 319.

ніва". У Даўгаўпілсе і Лудзы з'явіліся прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі, якія рабілі першыя крокі на шляху арганізацыі нацыянальна-культурнага жыцця. У 1905 г. Б. Эпімах-Шыпіла паспрабаваць арганізаваць беларускія гурткі ў Латвіі. У 1907 г. В. Ластоўскі разам з Э. Будзькам і Макарам Касцевічам распачаў працу па арганізацыі беларусаў Рыгі. Удзельнікі мясцовага гуртка чыталі лекцыі для настаўнікаў, ладзілі выступы перад працоўнымі, сустракаліся з інтэлігенцыяй. Аднак гэтая дзейнасць не мела развіцця[34]. Вось якім чынам той перыяд пазней апісваў К. Езавітаў: "*У местах Люцыне і Дзвінску паявіліся нацыянальна-свядомыя асобы і цэлыя сем'і, як Эпімах-Шыпілы – у Люцыне, Гаўронскія, Шакуны і Езавітавы – у Дзвінску, а пасля пачалі арганізоўвацца патаемныя вучнёўскія гурткі, як, напрыклад, рэвалюцыйны вучнёўскі гурток пры 2-м Дзвінскім мястовым 6-ціклясовым вучылішчы, які выпускаў рукапісныя вучнёўскія часопісы, як 'Пуга', 'Іскра', 'Бізун', пісаныя напалову па-беларуску, напалову па-расейску з добрымі малюнкамі ў фарбах*"[35]. На жаль, праз адсутнасць адпаведных крыніц немагчыма ані аспрэчыць, ані пацвердзіць праўдзівасці гэтых слоў. Аднак, аслабленне рэвалюцыйнай хвалі ў наступныя гады зрабіла немагчымым далейшую беларускую актыўнасць у Латвіі.

Пералом прынесла І сусветная вайна і выкліканыя ёй грамадска-палітычныя змены ў расійскай дзяржаве. У царскую армію было мабілізавана шмат прадстаўнікоў беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі. Многія служылі на Паўночным фронце, які ахопліваў тэрыторыю Латвіі. Лютаўская рэвалюцыя актывізавала нацыянальна-арганізацыйную працу сярод вайскоўцаў. 8 траўня 1917 г. у Рызе быў створаны гурток вайскоўцаў-беларусаў на чале з малодшым унтэр-афіцэрам 24-й асобнай тэлеграфнай роты Язэпам Мамонькам. Гэты гурток быў створаны па прыкладзе жаўнерскіх камітэтаў і яднаў вайскоўцаў, якія выступалі за фарміраванне беларускіх вайсковых адзінак у складзе расійскай арміі. Належыць адзначыць, што гэта быў першы беларускі вайсковы гурток у складзе рускай арміі. Большасць яго ўдзельнікаў належала да сяброў або прыхільнікаў Беларускай сацыялістычнай грамады (БСГ). Сярод беларускіх актывістаў Паўночнага фронту трэба ўзгадаць Я. Мамоньку, К. Езавітава, Я. Макарэвіча і Язэпа Данона. Дзякуючы іх намаганням, 20 ліпеня 1917 г. у Валцы на эстонска-латвійскім памежжы быў створаны Часовы выканаўчы камітэт вайскоўцаў-беларусаў 12-й арміі, які налічваў каля 1 тыс. чал. Тым часам, падпаручнік 151-га Пяцігорскага пяхотнага палка 38-й пяхотнай дывізіі К. Езавітаў арганізаваў землякоў у 5-й арміі, штаб якой напрыканцы 1917 г. размяшчаўся

---

[34] Н. Голубева, *Беларусы ў Латвіі*, [у:] *Беларускае замежжа*, рэд. Н. Голубева, Менск 2010, с. 193–194.

[35] К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, Рыга 1926, с. 50.

ў Даўгаўпілсе[36]. Варта дадаць, што ў верасні 1917 г. у Даўгаўпілсе адбыўся з'езд беларусаў – вайскоўцаў 5-й арміі, на якім быў абраны Беларускі нацыянальны камітэт. Наступ нямецкіх войскаў і захоп Рыгі (верасень 1917 г.) спыніў дзейнасць беларускіх жаўнерскіх асяродкаў на Паўночным фронце. Аднак восенню 1917 г. іх арганізатары (Я. Мамонька, К. Езавітаў) увайшлі ў склад Беларускай цэнтральнай вайсковай рады (БЦВР), якая аб'ядноўвала вайскоўцаў-беларусаў ва ўсёй рускай арміі[37]. Многія жаўнеры беларускага паходжання ўдзельнічалі ў баявых дзеяннях на тэрыторыі Латвіі ў 1915–1917 гг. Некаторыя з іх вызначыліся мужнасцю на полі бою. Сярод іх можна ўзгадаць К. Езавітава, які ў лістападзе 1917 г. быў прадстаўлены да ўзнагароды ордэнам Св. Станіслава 3-й ступені з мячамі і стужкай "*за фактычнае знаходжанне ў баявой абстаноўцы больш як паўгода*"[38].

Праявы беларускай актыўнасці назіраліся не толькі сярод вайскоўцаў, але і сярод цывільнага насельніцтва паўднёвай Латгаліі. Праўда, беларуская нацыянальная актыўнасць у гэтым рэгіёне слабой. Адной з прычын гэтага з'яўляўся факт, што Латгалія была аддаленая ад асяродкаў беларускага руху[39]. У лісце кіраўніку ўраду БНР К. Езавітаў адзначаў, што да 1920 гг. латгальскія беларусы былі "*адрэзаны ад беларускіх уплываў і знаходзіліся пад бальшавіцкай і польскай акупацыямі*"[40]. Тым не менш, праведзеныя Часовым урадам выбары ў гарадскія і мясцовыя органы самакіравання паспрыялі абуджэнню мясцовай беларускай інтэлігенцыі. У ліпені 1917 г. у склад дэпутатаў (галосных) Дрысенскага павятовага земства ад Пустынскай воласці быў абраны беларускі педагог і мовазнавец, сябра БСГ Язэп Сушынскі[41]. Галоўнай задачай дэпутата стала змаганне за стварэнне ў рэгіёне беларускіх школ. Дзеяч рашуча пратэставаў супраць прынцыпаў фарміравання павятовай школьнай камісіі, дзе пераважалі настаўнікі, варожа настроеныя да навучання па-беларуску[42]. Беларус абураўся, што ў ваколіцы былі адчыненыя польскія школы сярод мясцовага беларускамоўнага насельніцтва. Ён рашуча выступіў супраць прапановы мясцовага польскага дзеяча Юзэфа Падалевіча стварыць у рэгіёне польскія земскія школы. На думку беларускага дзеяча, у Пустынскай воласці, якую ён прадстаўляў, "*няма палякаў, а ёсць беларусы – праваслаў-*

---

[36] А. Латышонак, *Беларускія вайсковыя фармаваньні: 1917–1923 гады* [у:] Ён жа, *Жаўнеры БНР*, Вільня 2009, с. 40–44.

[37] Н. Голубева, *Беларусы ў Латвіі* [у:] *Беларускае замежжа*, рэд. Н. Голубева, Менск 2010, с. 194.

[38] РГВА, ф. 2765, оп. 2, д. 359, л. 104 об.–105, 136–136 об.; LVVA, 1612 f., 14 apr., 11 l., 25 lp.

[39] T. Błaszczak, I. Matiash, D. Michaluk, *Iwan Kraskowski (1880–1955). W służbie Białorusi i Ukrainie*, Białystok 2019, s. 165.

[40] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 56, л. 164.

[41] НАРБ, ф. 622, воп. 3, спр. 91, л. 14 адв.

[42] Тамсама, л. 30–32.

ныя і каталікі"[43]. Ён лічыў, што мясцовыя дзеці павінны вучыцца на роднай мове. Дэпутат-беларус падкрэсліваў, што "*раней школа не была нацыянальнай, таму тое, што вывучалася ў школе па-руску, хутка забывалася*"[44]. Дзеяч прапанаваў стварыць для мясцовай моладзі беларускамоўныя адукацыйныя ўстановы. Яго пазіцыя была станоўча ўспрынятая некаторымі дэпутатамі. Прыхільна паставіўся да прапановы беларуса сіяніст, нейкі Созет, які падтрымаў Я. Сушынскага ў тым, што школа павінна быць беларускай. Падобных поглядаў трымаўся і старшыня Дрысенскага павятовага настаўніцкага саюзу В. Камінскі, які адзначыў, што польскія школы павінны адчыняцца для палякаў, а не для апалячвання беларусаў[45].

У верасні 1917 г. сяляне Пустынскай воласці абралі Я. Сушынскага старшынём валасной земскай управы. Акрамя таго, была прынятая пастанова аб пераўтварэнні ў 1917/18 навучальным годзе ўсіх валасных земскіх школ у беларускія, пакінуўшы толькі адну рускую – для тутэйшых стараверaў. Пад уплывам Я. Сушынскага ідэі беларускага нацыянальнага руху знайшлі прыхільнікаў у мясцовай кіроўнай эліце. У снежні 1917 г. у Дрысе быў утвораны Беларускі рэвалюцыйны камітэт (БРК), у склад якога ўвайшлі Я. Сушынскі (старшыня), Б. Цяст, А. Касінскі, С. Тарасаў, а таксама старшыня Дрысенскай гарадской думы суддзя Павал Чэркас. На ўстаноўчым сходзе апошні заявіў: "*Хоць беларусаў спачатку палякі, а пасля маскалі хацелі перарабіць на свой лад, гэта нашым ворагам не ўдалося. Беларус застаўся беларусам і не страціў асаблівасці свае мовы і сваёй самабытнасці (...) Цяпер, калі ўся дэмакратыя змагаецца за самакіраванне нацыянальнасцяў, беларусы мусяць прачнуцца і арганізавацца дзеля абароны сваёй Бацькаўшчыны і адбудавання нацыянальнай культуры*"[46]. Неўзабаве Чэркас і Сушынскі былі абраныя ад мясцовых органаў самакіравання дэлегатамі на І Усебеларускі з'езд у Менску. На далейшы лёс камітэта паўплывалі палітычныя падзеі ў Расіі. Прыход да ўлады бальшавікоў і скасаванне імі земстваў, а таксама гарадскога самакіравання спынілі арганізацыю беларускіх школ у гэтым рэгіёне[47].

У другой палове 1919 г. – на пачатку 1920 г. на тэрыторыі Латвіі былі раскватараваныя беларускія жаўнеры літоўскага войска. 29 чэрвеня 1-я Асобная беларуская рота пад камандаваннем маёра Мікалая Яніцкага была накіраваная на літоўска-савецкі фронт у Ілукштанскім павеце, дзе яна ўвайшла ў склад ІІ брыгады. У тактычным плане беларусы падпарадкоўваліся камандаванню

---

[43] У. Ляхоўскі, *Школьная адукацыя ў Беларусі падчас нямецкай акупацыі (1915–1918 г.)*, Вільня 2010, с. 192.

[44] НАРБ, ф. 622, воп. 3, спр. 91, л. 35–35 адв.

[45] НАРБ, ф. 622, воп. 3, спр. 91, л. 35–35 адв.

[46] У. Ляхоўскі, *Школьная адукацыя...*, с. 192.

[47] Тамсама, с. 192–193.

Спецыяльнага Марыямпальскага батальёна. Улетку 1919 г. Беларуская асобная рота ўдзельнічала ў баях з польскімі войскамі ў ваколіцах Браслава, а потым зноў вярнулася ў Ілукштанскі павет. На мяжы чэрвеня і ліпеня рота брала ўдзел у сутыкненнях з Чырвонай арміяй. Беларускія жаўнеры ўдзельнічалі ў наступе літоўскіх і латвійскіх аддзелаў, які пачаўся 7 ліпеня і працягваўся да канца жніўня. У гэты час адзінка ўдзельнічала ў баявых дзеяннях. 12 ліпеня камандаванне ротай перайшло ў рукі падпалкоўніка Уладзіміра Міхайлоўскага[48]. У студзені 1920 г. дзве беларускія роты кватарвалі побач з мясцовасцю Калькуні (*Kalkūni*). Латвійскія вайковыя крыніцы інфармавалі, што стаўленне беларускіх жаўнераў да тутэйшага насельніцтва былі лепшым за адносіны літоўскіх вайскоўцаў. У кастрычніку 1920 г. беларусы былі вымушаны пакінуць Калькуні ў сувязі з наступам войскаў ген. Люцыяна Жалігоўскага[49]. Варта, аднак, пагадзіцца з Эрыксам Екабсонсам, што прысутнасць беларускіх жаўнераў не знайшла водгуку ў мясцовага беларускамоўнага насельніцтва[50]. Адзіным напамінам пра іх на гэтай зямлі сталі месцы пахаванняў тых, хто тут загінуў падчас баявых дзеянняў. На нямецкіх могілках у вёсцы Сусэкле былі пахаваныя кавалеры Крыжа Пагоні 1-й ступені паручнік Юры Пліска, капрал Юры Раманаў (палеглі 28 жніўня 1919 г. падчас штыхавога бою каля вёскі Сусэкле) і шараговец Хведар Паўлічэнка (загінуў 26 студзеня 1920 г.). Тым часам, на шляху з млына Шэдраў да маёнтка Новы Грунвальд быў пахаваны шараговы Ян Леановіч (загінуў 11 ліпеня 1919 г.). Акрамя таго, у мястэчках Абелі, Скапішкі і Ракішкі знаходзіліся магілы іншых беларускіх вайскоўцаў[51].

Завяршаючы агляд першых праяваў беларускай актыўнасці на латвійскіх землях, трэба адзначыць наступнае. Нягледзячы на геаграфічную аддаленасць рэгіёну ад цэнтраў нацыянальнага руху, не павінна здзіўляць цікавасць яго прадстаўнікоў да беларускамоўнага насельніцтва Латвіі. Беларускія адраджэнцы разглядалі мясцовых сялян як частку свайго народа на той падставе, што апошнія карысталіся беларускай мовай. З пункту гледжання беларускіх нацыянальных дзеячаў моўны фактар дамінаваў над іншымі, паколькі ён яднаў прадстаўнікоў беларускамоўнай супольнасці, незалежна ад рэлігійных ці сацыяльных падзелаў.

---

[48] А. Латышонак, *Беларускія вайсковыя фармаваньні: 1917–1923 гады* [у:] Ён жа, *Жаўнеры БНР*, Вільня 2009, с. 84.

[49] J. Jekabsons, *Stosunki między Łotwą i Białoruską Republiką Ludową w latach 1919–1921...*, s. 60–61.

[50] Э. Екабсонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [в:]) *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў,* Менск 2001, с. 48.

[51] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 179, л. 6.

Дзейнасць Беларускай Народнай Рэспублікі на тэрыторыі Латвіі (сярэдзіна 1919 – пачатак 1921 гг.)

Перадумовы арганізацыі і дзейнасці

Ажыўленне беларускага руху ў Латвіі было звязана з актывізацыяй дыпламатычнай дзейнасці ўлад Беларускай Народнай Рэспублікі. Апошнія добра зразумелі, што вырашэнне беларускага пытання ў значнай ступені залежыць ад міжнароднага фактару. Урад БНР разгарнуў актыўную дыпламатычную працу, каб зацікавіць справай беларускай дзяржаўнасці архітэктараў версальскай Еўропы, а таксама суседнія краіны, якія маглі дапамагчы беларусам у змаганні за незалежнасць. У сярэдзіне 1919 г. урад Антона Луцкевіча вырашыў пашырыць дыпламатычную дзейнасць на краіны Балтыі, якія ўваходзілі ў сферу ўплываў Вялікабрытаніі. У гэты час Лондан пачаў праяўляць шораз большую цікавасць да падтрымкі Латвіі і Эстоніі. Брытанцы бачылі іх у будучыні незалежнымі ад Расіі дэмакратычнымі дзяржавамі, палітычна і эканамічна звязанымі з Англіяй. Такім чынам, Лондан намагаўся пашырыць эканамічны ўплыў на Балтыю, а таксама не дапусціць аднаўлення расійскай і нямецкай гегемоніі ў рэгіёне. З гэтай мэтай па пачатку 1919 г. брытанскі бок скіраваў у Латвію вайсковую і дыпламатычную місіі, якія імкнуліся кансалідаваць мясцовыя праальянцкія сілы вакол латвійскага ўрада. Заангажаванасць Лондана ў балтыйскія справы спрасціла латышам і эстонцам змаганне за незалежнасць. Дзеячы БНР намагаліся выкарыстаць геапалітычныя абставіны і ўцягнуць беларускае пытанне ў арбіту брытанскіх інтарэсаў. Гэту задачу належала ажыццявіць, навязаўшы кантакты з Рагай і Талінам, каб потым праз іх уплываць на погляды Лондана. Палітычныя настроі ў балтыйскіх краінах, асабліва ў Латвіі, падавалася, спрыялі задумам беларускіх дзеячаў. Латвійскі ўрад прыхільна ставіўся да беларускіх незалежніцкіх памкненняў. Падчас Парыжскай мірнай канферэнцыі ў красавіку 1919 г. латвійская дэлегацыя прадставіла мемарандум, у якім падкрэсліла супольнасць гістарычных лёсаў латышскага і беларускага народаў, а таксама жаданне мець добрасуседскія адносіны з Беларуссю[52].

Адначасова прэм'ер А. Луцкевіч у Парыжы пачуў ад заходніх палітыкаў, што Беларусь, у адрозненне ад Балтыі, уваходзіць у сферу ўплываў Францыі, таму спалучэнне беларускага пытання з гэтым рэгіёнам з'яўляецца некарэктным[53].

---

[52] Д. Міхалюк, *Беларуская народная рэспубліка ў 1918–1920 гг. Ля вытокаў беларускай дзяржаўнасці*, Смаленск 2016, с. 405.

[53] Ю. Юркевіч, *Стварэнне і дзейнасць Асобнага атрада БНР у Балтыі* [у:] *Балахоўцы. Сведчанні. Дакументы. Даследаванні*, 2-е выданне, пераклад, прадмова і каментары А. Вашкевіч, А. Чарнякевіч, Ю. Юркевіч, Смаленск 2014, с. 97.

Французы не разглядалі ўсур'ёз беларускіх незалежніцкіх пастулатаў, таму справа пошуку прыхільнасці брытанцаў рабілася для дзеячаў БНР адным з прыярытэтаў міжнароднай палітыкі. Беларускія палітыкі ўскладалі надзеі на праект вайсковага саюзу з удзелам Латвіі, Літвы, Эстоніі, Украіны і Беларусі, які быў распрацаваны беларускай дэлегацыяй на Парыжскай мірнай канферэнцыі. Гэты саюз меў на мэце затрымаць бальшавіцкую навалу, стварыўшы фронт ад Балтыйскага да Чорнага мора пад агульным камандаваннем, але з захаваннем унутранай палітычнай аўтаноміі кожнага з бакоў[54]. Дэталі праекта прадставіў 21 траўня 1919 г. ген. Кіпрыян Кандратовіч, які знаходзіўся ў Парыжы ў складзе беларускай дэлегацыі. Ён лічыў, што сітуацыя, якая ўлетку 1919 г. склалася на франтах грамадзянскай вайны ў Расіі, спрыяла ідэі стварэння супольнага фронту на заходніх ускраінах былой Расійскай Імперыі. Ён таксама сцвярджаў, што дасюль маладыя рэспублікі паасобку вялі змаганне, што аслабляла іх у барацьбе з адзіным бальшавіцкім цэнтрам. Генерал заклікаў аб'яднаць намаганні, каб прыспешыць перамогу над бальшавізмам. Ген. Кандратовіч бачыў неабходнасць стварэння шматнацыянальнага заходняга фронту з удзелам эстонскай, літоўскай, латвійскай, беларускай, польскай, чэхаславацкай і румынскай армій. Кожная з іх магла захаваць уласныя інтарэсы і арганізацыю, але быць часткай агульнай узброенай супрацьбальшавіцкай сілы. Аўтар прапаноўваў стварыць супольны штаб на чале з галоўнакамандуючым з ліку альянцкіх военачальнікаў. Падагульняючы, ген. К. Кандратовіч адзначаў: "*Раз'яднаная дзейнасць армій вельмі нязручная для самых дзяржаў, якія вядуць барацьбу з бальшавізмам, бо яны вядуць толькі да прыватных поспехаў чыста мясцовага значэння і часовага характару; але пакуль крыніца сілы бальшавікоў – уся іх армія – не будзе знішчана, гэтыя прыватныя поспехі могуць быць паралізаваны адпаведнай канцэнтрацыяй супраць антыбальшавіцкіх франтоў бальшавіцкіх сіл з цэнтра і іншых франтоў. Толькі поўнае знішчэнне бальшавіцкіх армій можа цалкам зрабіць бяспечнымі дзяржавы і даць магчымасць спакойна перайсці да палітычнай і культурнай працы, а гэта можа быць дасягнута толькі шляхам аб'яднання ў баявых адносінах усіх армій дзеючых супраць бальшавіцкіх войск. Найлепшым прыкладам у гэтых адносінах служаць самі дзяржавы Пагаднення, якія дасягнулі поўнага баявога поспеху толькі пасля таго, калі ўсе іх узброеныя сілы былі аб'яднаны пад агульным камандаваннем у асобе маршала Фоша*"[55].

Беларускі бок намагаўся зацікавіць гэтым праектам прадстаўнікоў дэлегацый балтыйскіх краін на Парыжскай мірнай канферэнцыі. Беларусы прапаноўвалі падпісаць адпаведную вайсковую дамову і стварыць у Парыжы

[54] ERA, f. 1619, n. 1, s. 4, l. 3–4, 6–7.

[55] ERA, f. 1619, n. 1, s. 4, l. 8–11.

вайсковую раду зацікаўленых краін-удзельніц. Надзею на стварэнне саюзу давала нота скіраваная да кіраўніцтва Антанты ў сувязі з прызнаннем ёй усерасійскага ўраду ў Омску[56]. Пад дакументам падпісаліся прадстаўнікі Азербайджану, Грузіі, Паўночнага Каўказу, Латвіі, Эстоніі і Беларусі. Ад імя беларусаў яе падпісаў А. Луцкевіч[57].

Неўзабаве пасля гэтага ўрад Антона Луцкевіча распачаў дыпламатычныя захады на тэрыторыі Латвіі. 21 траўня 1919 г. Рада народных міністраў БНР вырашыла накіраваць у Балтыю прадстаўнікоў. Напрыканцы ліпеня 1919 г. у Рыгу прыбыў Кузьма Цярэшчанка. 24 ліпеня рускамоўная газета "Рижское слово" надрукавала інтэрв'ю з гэтым палітыкам, які паінфармаваў аб існаванні беларускай дзяржавы, а таксама выказаў спадзяванне на дапамогу Латвіі ў стварэнні супольнага антыбальшавіцкага фронту. 31 ліпеня беларускі дзеяч уручыў прэм'еру Карлісу Ульманісу (*Kārlis Ulmanis*) мемарандум з просьбай адчыніць у Рызе беларускае консульства і дапамагчы беларусам у змаганні супраць бальшавікоў[58].

Захады беларускага боку далі плён. 11 жніўня 1919 г. у Рызе было адчынена консульства БНР на чале з К. Цярэшчанкам. 27 жніўня ён быў акрэдытаваны пры МЗС Латвіі. Да працы консульства вернемся пазней, зараз варта падрабязна прасачыць беларускую дзейнасць у Латвіі на дыпламатычным і вайсковым напрамках. Кузьма Цярэшчанка быў першым беларускім палітыкам, які ў падрабязным рапарце азнаёміў латвійскія ўлады са становішчам дзяржаўнага будаўніцтва Беларусі, а таксама з дзейнасцю ўраду БНР[59]. Планы К. Цярэшчанкі сягалі далей. У рапарце ўраду БНР ён інфармаваў, што кіраўнік МЗС Латвіі Зігфрыдс Мееровіцс (*Zigfrīds Meierovics*) бачыць магчымым пасля перамогі над бальшавікамі заняццё памежных з Латвіяй беларускіх тэрыторый (Лудзенскага і Дзісненскага паветаў і, магчыма, Полацка) з мэтай ачышчэння іх ад бальшавікоў і перадачы ўраду БНР. У сувязі з гэтым беларускі дзеяч раіў рыхтавацца да разгортвання на гэтых землях уласных дзяржаўных структур абапіраючыся на выбранае за Часовым урадам валасное і павятовае самакіраванне, звязаўшы яго з дзяржаўнымі структурамі БНР. Акрамя таго, К. Цярэшчанка лічыў, што да моманту заняцця беларускіх тэрыторый латвійскімі войскамі неабходна дамагчыся ад латышоў мабілізацыі мясцовых беларусаў у латвійскае войска[60].

---

[56] ERA, f. 1619, n. 1, s. 4, l. 12; Таксама, s. 21, l. 32–35.

[57] *Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі* (АБНР), т. 1, кн. 1, укл.: С. Шупа, Вільня – Нью-Ёрк – Менск – Прага 1998, с. 360–361.

[58] E. Jekabsons, *Stosunki między Łotwą i Białoruską Republiką Ludową w latach 1919–1921*, "Białoruskie Zeszyty Historyczne" 1997, z. 7, s. 49–50.

[59] LCVA, f. 582, ap. 2, b. 32, l. 10–14.

[60] LCVA, f. 582, ap. 2, b. 32, l. 1–3.

У другой палове жніўня 1919 г. консул БНР звярнуўся да латвійскага ўраду з просьбай выдаць дазвол на накіраванне ў Вільню беларускіх ваенных уцекачоў, якія вярталіся з Расіі. Напрыканцы жніўня 1919 г. К. Цярэшчанка прапанаваў уладам БНР стварыць беларускую гандлёвую палату ў Рызе. Ён планаваў перамовы з латвійскімі ўладамі, каб атрымаць згоду на наданне беларускім дыпламатычным прадстаўніцтвам у гэтай краіне права на ўвоз тавараў, якія пасля вызвалення Беларусі падлягалі размеркаванню паміж жыхарамі. Меркавалася, што гэтыя тавары будуць перапрадавацца на Пскоўшчыну дзеля ўсталявання гандлёвых сувязей і павелічэння шанцаў на атрыманне замежнага крэдыту[61]. Да пытання пра гандлёвую палату беларускія палітыкі звярнуліся, бо дэлегацыя Украінскай Народнай Рэспублікі звярнулася з прапановай стварыць шматнацыянальную ўстанову з прадстаўнікоў камерцыйных і прамысловых колаў краін Балтыі, Фінляндыі, Польшчы, Украіны, Беларусі і Румыніі[62]. Пазней урад БНР збіраўся зладзіць у Рызе канферэнцыю беларускіх купцоў і прамыслоўцаў[63]. Нягледзячы на тое, што эканамічным планам К. Цярэшчанкі не было наканавана ажыццявіцца, ён выканаў місію па ўсталяванні беларуска-латвійскіх дыпламатычных кантактаў. Распачатую ім справу маглі працягваць іншыя дзеячы БНР. Праўда, з прычыны фінансавых цяжкасцей і адсутнасці выразных указанняў з боку прэм'ера, справа адкрыцця беларускага пасольства ў Рызе замаруджвалася[64].

Вайскова-дыпламатычная місія БНР у Балтыі

Фактычная беларуская дзейнасць у Латвіі пачалася ў верасні 1919 г., калі была створаная Вайскова-дыпламатычная місія (ВДМ) БНР у Балтыі. Рашэнне пра стварэнне дадзенай структуры Рада народных міністраў БНР прыняла 29 жніўня 1919 г. Кіраўніком новага органа 8 верасня 1919 г. быў прызначаны Кастусь Езавітаў[65]. 1 кастрычніка 1919 г. ён прыбыў у сталіцу Латвіі[66], а праз два дні акрэдытаваўся пры латвійскім урадзе[67]. Падчас уручэння акрэдытацыйнага дакумента кіраўнік ВДМ БНР і міністр замежных спраў З. Мееровіцс абмеркавалі стан міжнародных адносін у рэгіёне, К. Езавітаў падтрымаў ідэю стварэння Саюза балтыйскіх дзяржаў і заявіў, што Беларусь гатовая

---

[61] А. Ціхаміраў, *Беларусь у сістэме міжнародных адносін перыяду пасляваеннага ўладкавання Еўропы і польска-савецкай вайны (1918–1921 гг.),* Менск 2003, с. 165.

[62] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 72, л. 314.

[63] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 72, л. 383.

[64] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 49, л. 10.

[65] АБНР, т. 1, кн. 1, с. 445.

[66] К. Езавітаў, *Кароткі жыццяпіс і праходжаньне службы* [у:] *Беларуская мэмуарыстыка на эміграцыі*, укл.: Л. Юрэвіч, Нью-Ёрк 1999, с. 190; LCVA, f. 582, ap. 2, b. 32, l. 92.

[67] АБНР, т. 1, кн. 1, с. 445.

далучыцца да яго[68]. Акрамя К. Езавітава ў склад місіі ўвайшлі: падпалкоўнік Раман Шаўкоў (вайсковы дарадца) і Янка Чарапук (сакратар). Абодва былі акрэдытаваныя латвійскім урадам 3 кастрычніка 1919 г.[69] Праўда, апошні прыехаў у Рыгу толькі 20 снежня 1919 г. і тады пачаў выконваць службовыя абавязкі. Згодна з даверчай граматай урада БНР, сябры ВДМ надзяляліся паўнамоцтвамі "*весці перагаворы і рабіць папярэднія ўмовы як у справах ваенных, так і ў цывільных з Урадамі Латвіі і Эстоніі*"[70]. З часам склад ВДМ змяніўся і павялічыўся. 10 лістапада 1919 г. падпалкоўнік Р. Шаўкоў быў звольнены, а замест яго на пачатку 1920 г. вайсковым дарадцам прызначаны генерал-маёр Павел Вэнт, прадстаўнік Генштаба літоўскай арміі[71]. Напрыканцы 1919 г. у склад ВДМ уваходзілі: кіраўнік К. Езавітаў, сакратар Я. Чарапук, справавод (Рыгор Казячы) і кіраўнік прэс-бюро (Уладзімір Грунтоў)[72]. На пачатку 1920 г. місія складалася з 1) К. Езавітава (кіраўніка), 2) Я. Чарапука (сакратара), 3) Р. Казячага (справавода), 4) Я. Грузеўскага (кіраўніка прэс-аддзела), 5) Міколы Чарвякова (кіраўніка рэгістрацыйна-пашпартнага аддзела ў Фінляндыі), 6) Альберта Шанката (кіраўніка рэгістрацыйна-пашпартнага аддзела ў Таліне), 7) Л. Міхельсона (упаўнаважанага па бежанскіх справах у Нарве)[73]. Тым часам, увесну 1920 г. місія налічвала ажно 14 супрацоўнікаў[74]. Частку складалі грамадзяне БНР, якія знаходзіліся ў Латвіі на падставе дыпламатычных пашпартоў, іншыя – на падставе латвійскіх віз. Акрамя таго, у місіі лічыліся латвійскія грамадзяне, якія працавалі як тэхнічныя работнікі па кантракце[75]. Сядзіба ВДМ БНР знаходзілася

---

[68] E. Jekabsons, *Stosunki między Łotwą i Białoruską Republiką Ludową w latach 1919–1921*, "Białoruskie Zeszyty Historyczne" 1997, z. 7, s. 50.

[69] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 71, л. 2.

[70] ERA, f. 957, n. 8, s. 63, l. 1.

[71] У траўні 1920 г. кіраўнік ВДМ БНР прасіў латвійскага дыпламатычнага прадастаўніка ў Літве выдаць візу Паўлу Вэнту і яго жонцы Валерыі, каб яны маглі прыбыць у Рыгу. НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 72, л. 275.

[72] Разам з пераходам у чэрвені 1920 г. прэс-бюро ў прамое падпарадкаванне ўраду БНР К. Езавітаў прасіў вызначыць У. Грунтову новую службовую пасаду. НАРБ, ф. 225, воп. 1, спр. 72, л. 347.

[73] LCVA, f. 582, ap. 2, b. 32, l. 95.

[74] Склад ВДМ БНР быў наступны: 1) К. Езавітаў (кіраўнік), 2) Я. Чарапук (сакратар), 3) Эмануіл Сангайла-Станевіч (справавод), 4) Юры Гладкі, 5) Аляксандр Вальковіч, 6) Міхась Ляховіч (работнікі канцылярыі), 7) С. Кальмановіч (карэспандэнт-інфарматар), 8) Даніла Кадоўба, 9) Г. Гербер, 10) А. Дубровіч (дыпламатычныя кур'еры), 11) М. Каспар (вартаўнік), 12) Пётр Цвяткоў (кіраўнік аддзела ў Ліепаі), 13) Рыгор Злоцкі (памочнік кіраўніка аддзела ў Ліепаі), 14) Міхась Маркевіч (кіраўнік аддзела ў Таліне). НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 72, л. 170.

[75] Паводле ліста кіраўніка ДВМ БНР да кіраўніка Пашпартнага аддзела МЗС Латвіі ў чэрвені 1920 г. у складзе ДВМ БНР працавалі наступныя грамадзяне БНР, якія валодалі дыпламатычнымі пашпартамі: 1) К. Езавітаў (кіраўнік), 2) П. Вэнт (вайсковы дарадца), 3) Ю. Гладкі (часовы сакратар), 4) Г. Гербер (дыпламатычны кур'ер), 5) П. Цвяткоў (кіраўнік аддзела ў Ліепаі),

ў цэнтры латвійскай сталіцы на вуліцы Мікалаеўскай, 20/1 (зараз: *Krišjāņa Valdemāra iela, 20*)[76].

На першым этапе працы ВДМ было даручана ажыццяўляць дыпламатычна-консульскую дзейнасць, ствараць вайсковыя адзінкі для падтрымкі антыбальшавіцкага ўзброенага руху на Віцебшчыне, а таксама ўсталяваць кантакты з Паўночна-Заходнім урадам на чале з ген. Мікалаем Юдзенічам ды схіліць яго да прызнання БНР. Ужо 31 жніўня 1919 г. урад БНР даручыў навастворанаму органу пачаць перамовы з латвійскімі ўладамі з мэтай атрымання дазволу на транзіт з Нямеччыны ў Беларусь ваеннапалонных беларусаў[77]. Кіраўніцтва місіі падтрымлівала сталыя кантакты з латвійскім урадам. Гэта супрацоўніцтва было істотным элементам працы місіі, бо Латвія, суседка Беларусі, разглядалася як адна з галоўных хаўрусніц БНР. Праз латвійскае МЗС кіраўніцтва ВДМ інфармавала латвійскі ўрад пра палітычнае і ваеннае становішча ў Беларусі, а таксама прапагандавала ідэю беларускай незалежнасці. З гэтай мэтай у лютым 1920 г. было створана прэс-бюро, якое рыхтавала адпаведныя матэрыялы для латвійскай прэсы. Напрыклад, паведамленні пра гісторыю змагання беларускага народа за незалежнасць. У чэрвені 1920 г. прэс-бюро перайшло ў падпарадкаванне ўраду. У кастрычніку 1920 г. кіраўнік місіі прасіў урад БНР зацвердзіць каштарыс прэс-бюро ў памеры 7 тыс. латвійскіх рублёў[78].

Незалежна ад прэс-бюро актыўную інфармацыйную працу вёў сам К. Езавітаў. Цягам першых тыдняў на пасадзе кіраўніка ВДМ ён навязаў кантакты не толькі з латвійскімі палітыкамі і дзяржаўнымі дзеячамі, але і з прэсай. Беларускі дзеяч адсочваў звесткі пра Беларусь і беларуска-латвійскія адносіны, якія з'яўляліся на старонках латвійскіх газет. Апрача таго, кіраўнік ВДМ БНР даваў інтэрв'ю латвійскім журналістам асвятляючы ваенна-палітычныя падзеі ў Беларусі, латвійска-беларускія ўзаемаадносіны, нацыянальную сітуацыю ў Латгаліі і г.д. Можна сцвярджаць, што ў значнай ступені латвійскія газеты фарміравалі ўяўленне пра беларускія справы на падставе паведамленняў К. Езавітава. Ён таксама аспрэчваў звесткі пра беларусаў, якія, на яго думку, не адпавядалі рэчаіснасці[79]. У кастрычніку 1919 г. беларускі

---

6) М. Маркевіч (кіраўнік аддзела ў Таліне). Астатнія беларускія грамадзяне – супрацоўнікі місіі знаходзіліся ў Латвіі на падставе падставе віз. НАРБ, ф. 325. воп. 1, спр. 72, л. 298.

[76] Ю. Грыбоўскі, Э. Екабсонс, *Кастусь Езавітаў і ягоны "бэрлінскі" дзёньнік*, "Запісы БІНіМ" 2013, т. 36, с. 219.

[77] АБНР, т. 1, кн. 1, с. 419.

[78] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 46, л. 135–136.

[79] Увагу К. Езавітава выклікала публікацыя, аўтар якой адзначаў, што большасці беларускіх палітыкаў (3/4) выхавана ў расійскай культуры, таму жадае жыць у хаўрусе з Расіяй, тым часам, як астатнія (1/4), якія выхаваны ў польскай культуры, схіляюцца ў бок Польшчы. ERA, f. 957, n. 11, s. 259, l. 7–11.

дзеяч даў інтэрв'ю газеце "Свобода России", у якім адзначыў, што беларускія аддзелы змагаюцца з бальшавікамі пад Даўгаўпілсам, Полацкам і Менскам нягледзячы на тое, што Беларусь не ўваходзіць у *Entente cordiale*. Ён вітаў наступ войскаў М. Юдзеніча на Петраград і выказаў надзею на ажыццяўленне прынцыпу нацыянальнага самавызначэння народаў, зафіксаванага ў дэкларацыі ўраду Паўночна-заходняй арміі[80]. У рапарце да кіраўніцтва БНР К. Езавітаў пісаў, што, дзякуючы яго інфармацыйнай працы, ніводная латвійская і рускамоўная газета не абмінула ўвагай гадавіну склікання Першага Усебеларускага з'езда[81]. 7 кастрычніка 1919 г. кіраўнік ВДМ БНР даў чарговае інтэрв'ю рускамоўнай газеце "Сегодня", у якім сцвярджаў, што яго знаходжанне ў Рызе з'яўляецца вынікам дзейнасці МЗС БНР і сведчаннем таго, што ў Беларусі і Латвіі ёсць супольныя інтарэсы[82].

---

[80] Ю. Юркевіч, *Стварэнне і дзейнасць Асобнага атрада БНР у Балтыі* [у:] *Балахоўцы. Сведчанні. Дакументы. Даследаванні*, 2-е выданне, пераклад, прадмова і каментары А. Вашкевіч, А. Чарнякевіч, Ю. Юркевіч, Смаленск 2014, с. 94.

[81] 17 снежня 1919 г. кіраўнік ВДМ БНР даў вялікае інтэрв'ю мясцовай рускай газеце "Сегодня", падчас якога адзначыў: "*Я браў удзел у якасці дэлегата ва Усебеларускім з'ездзе, другую гадавіну якога мы, беларусы, святкуем. Я браў самы чынны ўдзел у працы з'езда. Пэўна, не памылюся, калі скажу, што з'езд быў найбольш удалым сярод усіх іншых, якія адбыліся на тэрыторыі Расеі пасля рэвалюцыі. Удзельнічала ў ім 1872 дэлегатаў, якія прадстаўлялі кожную беларускую вясковую гміну, кожны павет і губерню (...) Шумныя паседжанні Усебеларускага з'езда нагадвалі мне старажытнабеларускае веча. Гэты з'езд несумнеўна цалкам паказаў дэмакратычнае аблічча беларускага народа. З'езд адразу ж знайшоў супольную мову й прыняў шэраг істотных для беларускага народу рашэнняў, абвесціў Беларускую Народную Рэспубліку і абраў першы парламент (Раду рэспублікі), а таксама першую Раду міністраў. Рада міністраў мусіла зрабіць вялікую працу дзеля арганізацыі змагання з бальшавіцкімі і польскімі закусамі. На працягу двух гадоў барацьбы мы дайшлі да той хвіліны, калі маладое беларускае войска здолее ачысціць сваю тэрыторыю ад бальшавікоў. Не малая заслуга ў гэтай барацьбе належыць польскаму Вярхоўнаму камандванню, якое на польскай тэрыторыі за ракою Нараў стварыла з беларускіх грамадзянаў беларуска-літоўскі корпус, які браў галоўны ўдзел у вызваленні нашай тэрыторыі. На жаль, мушу зазначыць, што іншыя польскія адзінкі і частка польскага камандавання не заўсёды добра разумела, што вызваляе Беларусь, ператвараючы значэнне гэтага паходу ў імкненне далучыць Беларусь да Польшчы. Дадзеная тэндэнцыя ў першы перыяд страшна ўскладняла беларускую нацыянальную працу й выклікала сутыкненні паміж беларускімі сялянамі і польскімі легіністамі. У дадзены момант канфлікт страціў сваю вастрыню; Рада міністраў працуе ў Менску; там жа 12 лістапада сабралася рада БНР, якая на першым паседжанні прыняла пастанову цвёрда трымацца прынцыпаў незалежнасці Беларусі*". Цыт. пав.: Ю. Грыбоўскі, Э. Екабсонс, *Кастусь Езавітаў і яго "бэрлінскі" дзёньнік*, "Запісы БМНіМ" 2013, сш. 36, с. 220–221.

[82] Кіраўнік ВДМ БНР сцвярджаў, што з беларусамі вымушаны лічыцца літоўцы, доказам чаго з'яўляецца стварэнне ў складзе літоўскага ўраду Міністэрства беларускіх спраў. Аднак з моманту анулявання Берасцейскага пагаднення і стратай літоўцамі беларускіх тэрыторый роля МБС зводзіцца да міністэрства па справах беларускай меншасці ў Літве. Кастусь Езавітаў не выключаў літоўска-беларускай федэрацыі, якую лічыў вельмі пажаданай. НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 143, л. 14.

Трэба адзначыць, што эфектыўнасць працы ВДМ у значнай ступені была вынікам асабістай дзейнасці яе кіраўніка. Малады беларускі дзеяч здолеў зрабіць добрае ўражанне як на сваіх, так і на чужых[83]. Ён падтрымліваў партнёрскія адносіны з рускімі арганізацыямі Латвіі. Беларускі дзеяч спрыяў працы Таварыства расійскіх дактароў у Рызе. 7 студзеня 1920 г. ён узяў удзел у дабрачыннай вечарыне, якую зладзіла арганізацыя[84].

Ад пачатку кастрычніка да сярэдзіны лістапада 1919 г. праца ВДМ БНР адбывалася ва ўмовах непасрэдных ваенных дзеянняў. 8 кастрычніка 1919 г. пачаўся наступ Заходне-рускай арміі князя Паўла Бермонта-Авалава на Рыгу. Горад, які абаранялі аддзелы латвійскай самааховы і войска, абстрэльваўся з мора і з сушы. Нягледзячы на пагрозу жыццю, К. Езавітаў не пакінуў сталіцы Латвіі ў гэты цяжкі час. 13 кастрычніка 1919 г. на Тэатральнай плошчы ён быў лёгка паранены ў твар асколкам артылерыйскага снарада, але працягваў выконваць абавязкі[85]. 11 лістапада 1919 г. латвійска-эстонскія войскі прымусілі П. Бермонта-Авалава адступіць. 15 лістапада 1919 г. К. Езавітаў выслаў тэлеграму кіраўніку МЗС Латвіі з віншаваннямі з нагоды перамогі латышоў над войскамі агрэсара[86].

Важным напрамкам дзейнасці Вайскова-дыпламатычнай місіі БНР у Балтыі было ўсталяванне і падтрыманне сувязі з заходнімі дзяржавамі. Кіраўнік ВДМ БНР падзяляў меркаванне, што неабходна вывесці Беларусь са сферы ўплыву Парыжа і патрабаваць уключэння БНР у сферу зацікаўлення Лондана і Вашынгтона[87]. 26 лістапада 1919 г. у Таліне на просьбу К. Езавітава адбылася размова з падпалкоўнікам Самфардам Джонам Скабэлам, прадстаўніком Генштабу Брытанскай вайсковай місіі ў Расіі. Падчас сустрэчы кіраўнік ВДМ папрасіў дапамогі ў атрыманні амуніцыі для аддзела балахоўцаў. Таксама К. Езавітаў запэўніў суразмоўцу, што ў Беларусі пануюць антыбальшавіцкія і антынямецкія настроі. Беларускі палітык адзначыў, што ён

---

[83] Вельмі цёпла К. Езавітава ўзгадваў пазнейшы гісторык Мікалай Улашчык: "*Езавітаў відны быў хлопец. І талент – не па гадах: ад паручніка да палкоўніка, хуткі ўзлёт. І выглядаў на добрага еўрапейца – і фігурай, і манерамі. Латышам, казалі, вельмі імпанаваў сваёй паставай. Нашы з Менска – Іван Цвікевіч казаў – як прыехалі да яго, ледзь не лорда ўбачылі. Гожа глядзеўся*" (М. Улашчык, *Даць народу гісторыю. Успаміны, лісты,* Менск 2016, с. 334). Дзейнасць кіраўніка ВДМ БНР высока ацэніваў К. Дуж-Душэўскі, які ў рапарце (4 студзеня 1920 г.) А. Луцкевічу пісаў: "*Ён* [Езавітаў – ЕГ] *завёў добрые стасункі з усімі прэдстаўнікамі гэтых дзержаў. Яго шануюць. І трэба аддаць яму справядлівасьць што ен працуе дужа шмат і досыць добра. Можа есьць некаторые памылкі, але яны не вялікіе і тонуць у тэй працы якую ён тутака робіць і ужо зрабіў. Каб не было яго, было бы шмат горш*" (АБНР, т. 1, кн. 1, с. 585).

[84] The Hoover Institution Library and Archives – Stanford University (HI), Collection K. Yezovitov.

[85] АБНР, т. 1, кн. 1, с. 481.

[86] *Беларусы ў Латвіі*, "На чужыне" 1920, № 1, с. 4; LCVA, f. 582, ap. 2, b. 32, l. 90.

[87] Ю. Юркевіч, *Стварэнне і дзейнасць Асобнага атрада БНР у Балтыі*..., с. 101.

адмаўляецца ад нямецкай дапамогі, а таксама не прызнае аўтарытэту кіраўнікоў "белай" Расіі: Дзянікіна, Юдзеніча і Калчака. Сустрэча з беларусамі зрабіла дваістае ўражанне на брытанцаў. Брытанскі камісар па справах балтыйскіх дзяржаў палкоўнік Стэфан Талентс у дэпешы ў Лондан адзначаў, што погляды беларусаў незразумелыя. Тым больш, што К. Езавітаў адмовіўся даць інфармацыю пра колькасць беларускага войска. Брытанцы падтрымлівалі М. Юдзеніча, таму аптымізм беларускіх суразмоўцаў успрымалі стрымана[88]. У Рызе К. Езавітаў кантактаваўся з ген. Альфрэдам Несэлем кіраўніком міжальянцкай місіі па эвакуацыі нямецка-расійскіх войск з балтыйскіх краін[89]. 6 снежня 1919 г. сябры ВДМ у Рызе сустрэліся з ген. Альфрэдам Бертам, кіраўніком брытанскай ВДМ у Балтыі. Брытанскі прадстаўнік параіў беларусам звярнуцца да ўлад у Лондане і запэўніў, што брытанская місія дасць вайсковую дапамогу беларускім аддзелам адразу пасля таго, як Лондан прызнае БНР. Кастусь Езавітаў сустрэўся з адміралам 1-й брытанскай эскадры сэрам Уолтэрам Кованам у штабе эстонскай арміі ў Таліне. Беларус уручыў брытанцу кнігу Мітрафана Доўнар-Запольскага *Асновы беларускай дзяржаўнасці* на нямецкай і французскай мовах. Аднак кіраўнік брытанскай місіі ў Рызе С. Талентс адмовіўся ад сустрэчы з К. Езавітавым і не пажадаў абмяркоўваць справу прызнання Лонданам незалежнасці БНР, а амбасадар Вялікабрытаніі ў Фінляндыі раіў кіраўніцтву сваёй краіны не запрашаць прадстаўнікоў "так званай Беларускай рэспублікі" на 4-ю канферэнцыю балтыйскіх дзяржаў[90].

Адсутнасць цікавасці да беларускага пытання з боку брытанцаў не паўплывала на далейшыя спробы беларускага боку заручыцца падтрымкай альянтаў. 21 снежня 1919 г. кіраўнік ВДМ разам з прадстаўніком Асобнага атрада БНР палкоўнікам Мінгрэльскім сустрэліся з старшынём альянцкай місіі французскага генерала Анры Ніселя. Падчас размовы генерал адзначыў, што будзе абараняць ідэю незалежнасць Беларусі перад Вярхоўнай радай Антанты[91]. Адначасова беларускі бок працягваў шукаць магчымасці дамовіцца з брытанцамі. У рапарце (27 снежня 1919 г.) К. Езавітаў адзначаў, што падчас размовы з брытанскімі прадстаўнікамі ён адчуў жаданне дапамагчы беларускай справе, асабліва ў галіне забеспячэння беларускіх вайсковых аддзелаў[92]. 27 снежня 1919 г. кіраўнік ВДМ БНР рапартаваў А. Луцкевічу, што прадстаўнікі брытанскай місіі дэманструюць прыхільнае стаўленне да БНР і, магчыма, гатовыя дапамагчы ў фармаванні войска

---

[88] *Węzeł polsko-białoruski 1918–1921. Dokumenty i materiały*, Warszawa 2018, s. 337–338.

[89] Д. Міхалюк, *Беларуская народная рэспубліка ў 1918–1920 гг. Ля вытокаў беларускай дзяржаўнасці*, Смаленск 2016, с. 408.

[90] Ю. Юркевіч, *Стварэнне і дзейнасць Асобнага атрада БНР у Балтыі...*, с. 99–100.

[91] Ю. Юркевіч, *Стварэнне і дзейнасць Асобнага атрада БНР у Балтыі...*, с. 100.

[92] LCVA, f. 582, ap. 2, b. 32, l. 49.

і дзяржаўным будаўніцтве. Адначасова К. Езавітаў сцвярджаў, што адсутнасць больш падрабязнай інфармацыі пра Беларусь ускладняе супрацоўніцтва з альянтамі. Ён прасіў, каб як мага хутчэй былі адчыненыя місіі БНР у Англіі і Амерыцы. У выпадку немагчымасці дэлегаваць у гэтыя краіны ўрадавых прадстаўнікоў, К. Езавітаў прапаноўваў уласную кандыдатуру[93]. Кіраўнік ВДМ таксама рассылаў прапановы прызнаць БНР урадам Нарвегіі, Швецыі, Японіі і ЗША[94].

У студзені 1920 г. К. Езавітаў накіраваў ноту міністру замежных спраў ЗША з прапановай прызнаць незалежнасць БНР, дапамагчы ў барацьбе з бальшавікамі і прыняць беларускага дыпламатычнага прадстаўніка[95]. 20 студзеня беларускі дзеяч падрыхтаваў на імя статс-сакратара амерыканскага МЗС грунтоўны агляд вайскова-палітычнай сітуацыі Беларусі ў 1917–1919 гг.[96] На пачатку 1920 г. кіраўнік ВДМ БНР скіраваў два лісты да камандавання брытанскай эскадры ў Таліне, а таксама да ваенных місій Францыі, Вялікабрытаніі і ЗША з просьбай падтрымаць беларускае войска, да якіх К. Езавітаў залічваў: 1) літоўска-беларускія пяхотныя дывізіі польскага войска, 2) аддзелы "зялёных", 3) Асобны атрад БНР і 4) беларускія аддзелы ў польскай арміі, якія фарміраваліся пры ўдзеле Беларускай вайсковай камісіі. Падобны ліст К. Езавітаў падрыхтаваў на імя Вярхоўнай рады Антанты. Кіраўнік ВДМ адзначаў, што беларускія вайсковыя аддзелы "з выдатным нацыянальным і антыбальшавіцкім настроем" маюць значны баявы патэнцыял, бо складаюцца з добраахвотнікаў. Аўтар прасіў дапамогі для гэтых фарміраванняў, асабліва для Асобнага атрада БНР. Але альянты не спяшаліся дапамагаць беларусам. Яны з засцярогай ставіліся да маладога і малавядомага ім ураду, які, акрамя ўсяго, дзейнічаў у эміграцыі і меў абмежаваны ўплыў на сітуацыю на бацькаўшчыне. Французы параілі беларускім дзеячам кантактаваць з палякамі, а брытанцы наогул паставіліся са зразуменнем да звароту, але прапанавалі ўрэгуляваць стасункі з уладамі БНР праз адпаведную дамову. Тым часам, амерыканцы далі канкрэтную дапамогу (коўдры, ложкі, бялізна, лекі, кансервы для шпіталя) Асобнаму атраду БНР праз Рыжскую місію Чырвонага крыжа[97]. На просьбу ВДМ па лініі Амерыканскага чырвонага крыжа аддзел балахоўцаў быў забяспечаны лекамі, бялізнай і вопраткай, а таксама атрымаў палявы шпіталь у Алукснэ[98].

---

[93] АБНР, т. 1, кн. 1, с. 564.

[94] Д. Міхалюк, *Беларуская народная рэспубліка ў 1918–1920 гг. Ля вытокаў беларускай дзяржаўнасці*, Смаленск 2016, с. 408.

[95] АБНР, т. 1, кн. 1, с. 573.

[96] *За Дзяржаўную Незалежнасьць Беларусі*, Лёндан 1960, с. 48–50.

[97] Ю. Юркевіч, *Стварэнне і дзейнасць Асобнага атрада БНР у Балтыі*..., с. 101–102.

[98] LYA, K-l, ap. 58, b. P-7427, Пратакол допытаў К. Езавітава, 19 II 1946 г.

2 чэрвеня 1920 г. К. Езавітаў прапанаваў В. Ластоўскаму стварыць у Рызе Беларускае прэс-бюро (у складзе кіраўніка, сакратара і машыністкі), якое павінна было займацца інфармаваннем замежнай прэсы ў Расіі, Скандынавіі, Фінляндыі і Заходняй Еўропе пра становішча ў Беларусі[99]. Аднак прэм'ер не бачыў у гэтым патрэбы, паколькі інфармаваннем заходнееўрапейскіх дзяржаваў займаліся ўлады БНР. Замест гэтага ён заклікаў К. Езавітава працягваць інфармацыйную працу ў межах сваіх магчымасцей і кампетэнцый[100].

Падсумоўваючы высілкі прадстаўнікоў БНР у Латвіі, скіраваныя на атрыманне дыпламатычнай і матэрыяльнай падтрымкі з боку заходніх альянтаў, належыць адзначыць, што яны не прынеслі жаданых вынікаў. Аднак нам бачыцца, што не было ў гэтым віны беларускіх дзеячаў, якія не шкадавалі сіл на інфармацыйную кампанію. Пасіўнае стаўленне французаў да беларускіх дэкларацый належыць тлумачыць іх адданасцю палітычнаму прынцыпу, згодна з якім Балтыя не ўваходзіла ў сферу іх непасрэдных інтарэсаў. Тым часам брытанцы, якія лічылі рэгіён за сферу сваёй адказнасці, мелі іншыя прычыны, каб не падтрымаць беларусаў. На думку Юрася Юркевіча паразы "белых" пры канцы 1919 г. і на пачатку 1920 г. прымусілі Вялікабрытанію адмовіцца ад стратэгічнага наступу з Балтыі на Савецкую Расію. Гэта перадвызначыла іх стрыманае стаўленне да беларускіх прапаноў[101].

На тэрыторыі Латвіі адбываліся таксама беларуска-польскія палітычныя кантакты. Восенню 1919 г. кіраўнік ВДМ спрабаваў наладзіць шчыльнейшыя сувязі з польскай дыпламатычнай місіяй у Латвіі, якой кіраваў Браніслаў Боўфал. Апошні ахвяраваў 100 рублёў на беларускі дабрачынны канцэрт у Рызе, а таксама паспрыяў сястры Клаўдзія Дуж-Душэўскага ў атрыманні візы на прыезд у Вільню. Вядома, што К. Езавітаў некалькі разоў наведаў польскага дыпламата. Падчас аднаго з візітаў у снежні 1919 г. К. Езавітаў і К. Дуж-Душэўскі падкрэслілі жаданне БНР мець добрасуседскія адносіны з Польшчай. Польскі дыпламат паведаміў, што не мае кампетэнцый выказвацца наконт будучыні Беларусі, але асабіста ён з сімпатыяй ставіцца да беларускай справы. Прыемная атмасфера размовы ледзь не была сапсаваная, калі Б. Боўфал прыгадаў брашуру К. Езавітава *Белоруссы и поляки* (Коўна 1919). Польскі суразмоўца выказаў шкадаванне, што аўтар неаб'ектыўна паказаў у ёй Польшчу карыстаючыся працамі рускіх імперскіх гісторыкаў. Спрабуючы выкруціцца з нязручнай сітуацыі, кіраўнік ВДМ пераконваў, што падчас працы з брашурай не быў добра паінфармаваны пра польска-беларускія адносіны і абяцаў, што ў новым выданні ўлічыць заўвагі польскага дыпламата. Б. Боўфал не верыў у шчырасць беларускіх заяў пра супрацоўніцтва

---

[99] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 72, л. 303.

[100] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 46, л. 62.

[101] Ю. Юркевіч, *Стварэнне і дзейнасць Асобнага атрада БНР у Балтыі*..., с. 114, 123.

і сяброўства, лічачы, што жаданне беларусаў мець добрыя адносіны з польскай місіяй належыць тлумачыць пошукам грошай на далейшую дзейнасць[102].

Па меры пагаршэння польска-беларускіх адносін пасля фарміравання ўрада В. Ластоўскага, адчувалася і варожасць прадстаўніцтва БНР у Рызе да польскага боку. 14 студзеня 1920 г. К. Езавітаў звярнуўся да кіраўніка МЗС Вялікабрытаніі лорда Джорджа Керзона з просьбай абараніць Беларусь ад агрэсіі з боку Польшчы. Кіраўнік ВДМ прасіў прадухіліць польскую анексію Беларусі, а таксама скіраваць у Беларусь саюзную камісію з мэтай расследавання актаў польскага гвалту над беларусамі, накшталт камісіі Генры Маргентау, якая займалася справай гвалту супраць габрэяў. Беларускі дзеяч бачыў патрэбу стварыць у Беларусі пастаянную місію Аб'яднанага каралеўства[103]. 9 лютага 1920 г. К. Езавітаў скіраваў на імя кіраўніка брытанскай дыпламатыі пратэст ураду БНР супраць меркаванага польскага плебісцыту ў Беларусі, які, нібыта, мусіў вызначыць дзяржаўную прыналежнасць беларускіх земляў. У дакуменце адзначалася, што беларускі народ не патрабуе плебісцыту, бо ён вуснамі ўдзельнікаў Усебеларускага з'езда выказаў сваю волю, а беларускі ўрад робіць усе намаганні, каб вызваліць Бацькаўшчыну ад бальшавікоў[104].

Больш удала складаліся адносіны з урадамі краін балтыйскага рэгіёну, на тэрыторыю якіх пашыралася юрысдыкцыя Вайскова-дыпламатычнай місіі. Напрыканцы кастрычніка 1919 г. К. Езавітаў наведаў Фінляндыю[105]. 26 і 27 кастрычніка ў Хельсінкі кіраўнік ВДМ сустрэўся з Рудольфам Хольсі, міністрам замежных спраў краіны. Падчас аўдыенцыі беларускі дзеяч азнаёміў кіраўніка фінскага МЗС з сітуацыяй у Беларусі. Сустрэўся К. Езавітаў і з Мануілам Маргуліесам, міністрам гандлю, прамысловасці, забеспячэння і аховы здароўя Паўночна-заходняга ўрада. Акрамя таго, падчас знаходжання ў Фінляндыі, кіраўніку ВДМ БНР удалося зацікавіць беларускай справай некаторых былых царскіх афіцэраў. Ён пазнаёміўся з генералам Алегам Корчак-Крыніца-Васількоўскім, былым камандуючым Петраградскай вайсковай акругай. Гэты рускі паводле выхавання вайсковец не мог знайсці сабе месца ў асяроддзі "белых" рускіх з Паўночна-заходняй арміі ген. М. Юдзеніча. Імаверна, гэта схіліла яго да супрацоўніцтва з беларусамі і ён

---

[102] Пасля сустрэчы з беларусамі Б. Боўфал пакінуў у сваім дзённіку наступны запіс: "*Нягледзячы на гэта ўсё, размова скончылася прыязна і беларусы пакінулі мяне, запэўніваючы ў сваіх сімпатыях да Польшчы як такой, і толькі адзначылі, што выступаюць толькі супраць асобных злоўжыванняў адміністрацыі, супраць шавінізму народнай дэмакратыі*". *Węzeł polsko-białoruski 1918–1921. Dokumenty i materiały*, Warszawa 2018, s. 360–361.

[103] *Węzeł polsko-białoruski 1918–1921. Dokumenty i materiały*, Warszawa 2018, s. 380–381.

[104] *Węzeł polsko-białoruski 1918–1921. Dokumenty i materiały*, Warszawa 2018, s. 396–398.

[105] У рапарце К. Езавітаў пісаў, "у вялікую буру" ён паромам адплыў у Хельсінкі 25 кастрычніка. LCVA, f. 582, ap. 2, b. 32, l. 25.

вызваўся прадстаўляць інтарэсы БНР у Фінляндыі[106]. Кастусь Езавітаў "*даў яму мандат як беларускаму грамадзяніну і генералу на здабыванне грошай на беларускія фармаванні*"[107]. Праўда, тая ініцыятыва не мела працягу, а супрацоўніцтва паміж кіраўніком ВДМ БНР і ген. Васількоўскім не было найлепшым. Тым не менш, былы царскі генерал яшчэ некалькі месяцаў захоўваў лаяльнасць да ўлад БНР[108].

Плёнам візіту К. Езавітава ў Хельсінкі была арганізацыя консульства БНР у Фінляндыі. Беларуская грамада ў гэтай краіне была нешматлікай і незгуртаванай. Кіраўнік ВДМ даручыў Міколу Чарвякову справу рэгістрацыі беларусаў у Фінляндыі, дзеля далейшае выдачы ім пашпартоў БНР. У выніку былі адчыненыя пашпартна-рэгістрацыйныя аддзелы БНР у Хельсінкі і Тамерсфорсе (кіраўнік М. Чарвякоў). 28 кастрычніка 1919 г. К. Езавітаў даў абвестку ў мясцовай прэсе пра пачатак рэгістрацыі беларусаў Фінляндыі[109]. 19 лістапада 1919 г. кіраўнік ВДМ даў М. Чарвякову паўнамоцтвы выпісваць часовыя пасведчанні беларусам, якія знаходзіліся ў Фінляндыі[110].

Кіраўнік ВДМ БНР разгарнуў дыпламатычную і арганізацыйную працу ў Эстоніі. У кастрычніку 1919 г. К. Езавітаў наведаў Талін, акрэдытаваўся пры ўрадзе Эстоніі; наладзіў прыязныя адносіны з мясцовай эстонскай і рускай прэсай, а таксама адчыніў у эстонскай сталіцы рэгістрацыйна-пашпартны аддзел (кіраўнік Дзяніс Шанк). Апрача таго, у Таліне быў створаны Беларускі нацыянальны камітэт (іншая назва: Рада Беларускай калоніі ў Эстоніі). Разам з К. Дуж-Душэўскім кіраўнік ВДМ БНР у кастрычніку 1919 г. узяў удзел у канферэнцыі прадстаўнікоў урадаў балтыйскіх дзяржаў у Тарту, на якой заявіў,

---

[106] На пасаду вайскова-дыпламатычнага прадстаўніка БНР у Фінляндыі ген. А. Корчак-Крыніца-Васількоўскі быў прызначаны толькі 25 чэрвеня 1920 г. Іншы былы царскі афіцэр, карэльскі фін, палкоўнік Ю́р'ё Эльфенгрэн стаў дарадцам ген. А. Корчак-Крыніца-Васількоўскага. Яго маці мела беларускае паходжанне, дзякуючы чаму палкоўнік змог на нейкі час "стаць беларусам". Першапачаткова ген. Васількоўскага некаторыя беларускія дзеячы разглядалі як кандыдата на галоўнакамандуючага беларускім войскам. Ад імя ўлад БНР ён усталяваў сувязі з альянтамі ў Фінляндыі. 30 кастрычніка 1920 г. ён быў прызначаны прадстаўніком БНР у Эстоніі. Яго дзейнасць была даволі пазітыўна ацэненая кіраўніцтвам БНР. Аднак у 1921 г. ген. Васількоўскі і яго дарадца спынілі супрацоўніцтва з беларускімі ўладамі. Гл. больш: К.А. Таросов, А.С. Горный, *Между Беларусью и "белой" Россией: генерал Васильковский в эмиграции*, (в:) *Нансиновские чтения*, ред. В.Ю. Черняев, СПб 2000, с. 536–540.

[107] LCVA, f. 582, ap. 2, b. 32, l. 25.

[108] У чэрвені 1920 г. К. Езавітаў скардзіўся, што ген. А. Корчак-Крыніца-Васількоўскі не адказваў на яго лісты і не даў гадавой справаздачы пра сваю дзейнасць (НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 59, л. 81). У чэрвені 1920 г. В. Ластоўскі раіў К. Езавітаву выехаць у Фінляндыю дзеля расследавання на месцы справы ген. Васількоўскага. Аднак праз адсутнасць грошай кіраўнік ВДМ БНР не змог выканаць гэтага задання (НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 46, л. 64).

[109] АБНР, т. 1, кн. 1, с. 478.

[110] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 72, л. 2. LCVA, f. 582, ap. 2, b. 32, l. 25.

што малыя народы павінны ўзяць свой лёс ва ўласныя рукі, а Тарту мусіць стацца для іх "другім Парыжам". Акрамя таго, К. Езавітаў зладзіў шэраг сустрэч з эстонскімі ўрадоўцамі[111]. Размовы з латышамі і эстонцамі давалі кіраўніку ВДМ БНР надзею на далейшае паспяховае супрацоўніцтва з гэтымі народамі[112]. У кастрычніку 1919 г. у Рызе адбылася канферэнцыя прэм'ер-міністраў балтыйскіх краін, вынікі якой яшчэ больш узмацнілі перакананне К. Езавітава, што балты прыхільна ставяцца да ідэі незалежнасці БНР[113]. У кастрычніку 1919 г. сакратар ВДМ БНР Я. Чарапук з энтузіязмам інфармаваў урад БНР, што, дзякуючы актыўнасці місіі, дыпламатычная справа ў Латвіі і Эстоніі ўзнятая на належны ўзровень, а латвійскі і эстонскі бакі бачаць месца Беларусі ў саюзе балтыйскіх дзяржаў. У сувязі з гэтым ён раіў кіраўніцтву Рады народных міністраў асабіста прыбыць у Рыгу, а таксама схіліць Англію да аказання дапамогі БНР у выглядзе вайсковага рыштунку і грашовых пазык[114].

Каб надаць балтыйскаму напрамку прыярытэтнае значэнне, некаторыя дзеячы БНР лічылі неабходным павысіць ранг дыпламатычнага прадстаўніцтва ў Рызе. 11 кастрычніка 1919 г. Лявон Заяц пісаў А. Луцкевічу, што "*Езавітаў са сваёй камісіяй, якая (...) высока трымае дзяржаўна-нацыянальнае знамя, і яны атрымалі згоду з боку Латвіі на ўчасце ў працы камісіяў, але у пасяджэнні міністраў іх не пусцяць, бо чакаюць нашага Міністра Загр. спраў*"[115]. Перспектывы далейшай працы на балтыйскім напрамку К. Езавітаў прадставіў у рапарце прэм'еру БНР 6 лістапада 1919 г. У гэтым дакуменце ён прапаноўваў: 1) адчыніць консульствы ў Таліне і Ліепаі, 2) выслаць місію ў Фінляндыю, Швецыю і Англію альбо Данію, а таксама ў ЗША; 3) перацягнуць на бок БНР аддзел ген. Станіслава Булак-Балаховіча. Адначасова аўтар рапарту прасіў пашырыць склад ВДМ БНР, паколькі сам кіраўнік не быў у стане займацца ўсімі справамі. Акрамя таго, К. Езавітаў прасіў дазволу павялічыць выдаткі на канцылярыю і службоўцаў. Ён прасіў таксама даслаць як мага больш пашпартоў і літаратуры[116]. Аднак тагачасны прэм'ер ураду БНР А. Луцкевіч надаваў большае значэнне адносінам з Польшчай, мяркуючы, што Варшава становіцца цэнтрам усходняй палітыкі. Асаблівыя надзеі ён ускладаў на супрацоўніцтва з начальнікам польскай дзяржавы

---

111 LCVA, f. 582, ap. 2, b. 32, l. 97.

112 Сведчыць пра гэта тэлеграма (25 лістапада 1919 г.) К. Езавітава ўраду БНР, у якой чытаем: "*Канфэрэнцыя Юр'еве прызнала незалежнасць Беларусі. Душэўскі дабіўся афіцыяльнага прызнання ад Фінляндыі. Працуем [у] кантакце. Асобны атрад Беларускай Рэспублікі пад камандаю Балаховіча добра ваюе*". LCVA, f. 582, ap. 2, b. 32, l. 88.

113 Д. Міхалюк, *Беларуская народная рэспубліка ў 1918–1920 гг. Ля вытокаў беларускай дзяржаўнасці*, Смаленск 2016, с. 415.

114 LCVA, f. 582, ap. 2, b. 32, l. 9.

115 АБНР, т. 1, кн. 1, с. 451.

116 АБНР, т. 1, кн. 1, с. 480.

Юзафам Пілсудскім. Нягледзячы на тое, што прэм'ер асабіста не змог наведаць Латвію 5 лістапада 1919 г., ён прызначыў надзвычайным упаўнаважаным ураду БНР у Балтыі Клаўдзія Дуж-Душэўскага. У сувязі з гэтым прызначэннем 19 лістапада 1919 г. Я. Чарапук рапартаваў А. Луцкевічу пра патрэбу змяніць назву з Вайскова-дыпламатычнай місіі на Надзвычайную дыпламатычную[117]. Аднак было вырашана пакінуць старую назву. 20 снежня 1919 г. К. Дуж-Душэўскі прыехаў у Рыгу, дзе прабыў да 7 студзеня 1920 г.[118] 29 студзеня 1920 г. прэм'ер А. Луцкевіч прызначыў надзвычайным паслом БНР у Латвіі Аляксандра Цвікевіча[119].

Паколькі сядзіба ВДМ знаходзілася ў сталіцы Латвіі, дык і яе праца мела найбольшы ўплыў на беларуска-латвійскія адносіны. Дзейнасць Вайскова-дыпламатычнай місіі БНР спрычынілася да ажыўлення беларуска-латвійскіх палітычных сувязей. Улады ў Рызе бачылі ў БНР патэнцыйнага хаўрусніка ў змаганні з расійскім імперыялізмам і імкнуліся мець з ёй добрасуседскія адносіны. Беларускія дзеячы разлічвалі выкарыстаць Латвію як вайсковы плацдарм для антыбальшавіцкай дзейнасці на бацькаўшчыне. З дапамогай беларускіх фарміраванняў у паўночна-заходняй частцы Віцебскай губерні (у Латгаліі) планавалася стварыць базу для далейшага вайсковага і дзяржаўнага будаўніцтва незалежнай беларускай дзяржавы. Таму не павінна здзіўляць, што яшчэ ў жніўні 1919 г. з'явілася ідэя сфарміраваць беларускія вайсковыя аддзелы на латвійскай тэрыторыі[120]. Прэм'ер А. Луцкевіч падкрэсліў, што ўдзел беларусаў у барацьбе за незалежнасць Латвіі стане трывалым падмуркам адвечнай згоды і братэрства паміж двума народамі. Тым часам, К. Цярэшчанка прасіў латышскі бок вылучыць беларусам участак фронту, з якога пасля перамогі над бальшавікамі беларускія аддзелы маглі б увайсці ў Беларусь[121]. Справа набыла актуальнасць пасля таго, як К. Езавітаў схіліў перайсці на беларускую службу ген. С. Булак-Балаховіча. Гэта чалавек зарэкамендаваў сябе як здольны і адважны вайсковец, праславіўся ўдалымі аперацыямі супраць Чырвонай арміі на Пскоўшчыне. Спачатку ген. С. Булак-Балаховіч змагаўся ў складзе войскаў ген. М. Юдзеніча, аднак пасля канфлікту пакінуў яго. Гэтую сітуацыю выкарыстаў кіраўнік ВДМ БНР, які ад імя беларускіх улад пачаў з ім перамовы. Аддзел ген. С. Булак-Балаховіча налічваў каля 1200 жаўнераў і складаўся з кавалерыйскага, пяхотнага і артылерыйскага палкоў. Балахоўцы стаялі на тэрыторыі Эстоніі і дзейнічалі ў складзе 2-й дывізіі,

---

[117] АБНР, т. 1, кн. 1, с. 506–507.

[118] АБНР, т. 1, кн. 1, с. 472; E. Jekabsons, *Stosunki między Łotwą i Białoruską Republiką Ludową w latach 1919–1921*, s. 51.

[119] АБНР, т. 1, кн. 1, с. 638.

[120] НАРБ. Ф. 325. Воп. 1. Спр. 49. Л. 10.

[121] E. Jekabsons, *Stosunki między Łotwą i Białoruską Republiką Ludową w latach 1919–1921*, "Białoruskie Zeszyty Historyczne" 1997, z. 7, s. 49–50.

атрымаўшы свой участак эстонска-бальшавіцкага фронту (пад Ізборскам) і ў аператыўным сэнсе падпарадкоўваліся эстонскаму камандаванню. Гэтыя загартаваныя ў баях жаўнеры ўяўлялі значную каштоўнасць для ўрада БНР, які не меў уласных узброеных сіл. У выніку перамоў з К. Езавітавым ген. С. Булак-Балаховіч прыняў прапанову перайсці на службу да ўраду БНР. 14 лістапада 1919 г. ён падаў кіраўніку ВДМ БНР заяву пра сваё беларускае паходжанне і просьбу надаць яму грамадзянства БНР[122].

26 лістапада ўпаўнаважаны прадстаўнік уряду БНР у Балтыі К. Дуж-Душэўскі звярнуўся да МЗС Эстоніі з прапановай, каб эстонскі бок узяў на сябе ўтрыманне Асобнага атрада войск БНР у Балтыі (так у афіцыйнай дакументацыі БНР называлі балахоўцаў пасля пераходу на беларускую службу) у межах крэдыту, дадзенага БНР[123]. Заява С. Булак-Балаховіча пра пераход на беларускую службу была значным поспехам Вайскова-дыпламатычнай місіі БНР і яе кіраўніка К. Езавітава. Аднак планы беларускіх дзеячаў не абмяжоўваліся выкарыстаннем балахоўцаў у Эстоніі. У перспектыве беларускі бок планаваў перакінуць іх у Латгалію[124].

Поспех з ген. С. Булак-Балаховічам восенню 1919 г. дазваляў беларускім дзеячам у Балтыі спадзявацца на арганізацыю беларускага войска. ВДМ БНР дабівалася ад латвійскага ўраду згоды на мабілізацыю сваіх грамадзян у беларускае войска. Разглядаліся два варыянты: 1) заклік мясцовага аўтахтоннага беларускага насельніцтва Латгаліі і асоб, якія атрымалі пашпарты БНР; 2) заклік беларусаў – вайскоўцаў Паўночна-заходняй і латвійскай армій. Надзеі беларускіх дзеячаў падмацоўваў факт, што частка беларусаў – вайскоўцаў іншаземных армій выказвала жаданне змагацца пад штандарам БНР. Калі кіраўнік ДВМ БНР быў у Эстоніі ў кастрычніку 1919 г., да яго звярталіся жаўнеры Паўночна-заходняй арміі. Паводле К. Езавітава, беларусы ў гэтай арміі складалі 40–50% асабовага складу[125].

Былі беларусы і ў шэрагах латвійскага войска. Кіраўнік ВДМ БНР лічыў, што прынамсі частка з іх гатовая служыць беларускай справе[126]. У сувязі

---

[122] Афіцыйна беларускія ўлады прынялі на службу балахоўцаў больш як праз два месяцы. 22 студзеня 1920 г. Найвышэйшая Рада БНР выдала пастанову пра залічэнне балахоўцаў на беларускую службу, калі аддзел кватараваўся ўжо ў Латвіі, у Алукснэ. *За дзяржаўную незалежнасьць Беларусі,* Лёндан 1960, с. 51.

[123] *За дзяржаўную незалежнасьць Беларусі*, Лёндан 1960, с. 46; LYA, K-l, ap. 58, b. P-7427, Пратакол допытаў К. Езавітава, 19 II 1946 г.

[124] Ю. Юркевіч, *Стварэнне і дзейнасць Асобнага атрада БНР у Балтыі* [у:] *Балахоўцы. Сведчанні. Дакументы. Даследаванні*, 2-е выданне, пераклад, прадмова і каментары А. Вашкевіч, А. Чарнякевіч, Ю. Юркевіч, Смаленск 2014, с. 114, 123.

[125] Ю. Юркевіч, *Стварэнне і дзейнасць Асобнага атрада БНР у Балтыі*..., с. 136–137.

[126] 2 чэрвеня 1920 г. К. Езавітаў пісаў прэм'еру БНР аб тым, што ў латвійскае войска мабілізавана 300–400 беларусаў (НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 59, л. 266). Сярод іх быў капітан

з гэтым К. Езавітаў узняў перад латвійскімі ўладамі пытанне пра стварэнне беларускіх аддзелаў на тэрыторыі Латвіі. 5 лістапада 1919 г. урад БНР прыняў пастанову, у якой выказаў згоду заклікаць грамадзян БНР у Латвіі ў латвійскае войска па прынцыпе ўзаемнасці. Гэта абгрунтоўвалася тым, што і Беларусь, і Латвія апынуліся перад абліччам агульнай пагрозы з боку бальшавікоў. Адначасова беларускі бок прапанаваў ствараць з беларусаў асобныя вайсковыя часці пад камандаваннем беларускіх афіцэраў[127]. Пасля ўступных перамоваў з латышамі 10 лістапада 1919 г. беларускі бок быў амаль перакананы, што яму ўдасца атрымаць згоду латвійскага ўраду на фарміраванне беларускіх аддзелаў. 11 лістапада 1919 г. мясцовая расійская прэса ў Рызе нават пісала, што ВДМ БНР са згоды Латвіі пачынае мабілізацыю сваіх грамадзян. 12 лістапада 1919 г. у газеце "Сегодня" з'явілася інфармацыя, што ўлады БНР будуць праводзіць мабілізацыю ў Латвіі. У размове з карэспандэнтам газеты консул Барыс Шымковіч заявіў, што мабілізаваныя грамадзяне будуць хутчэй за ўсё скіраваныя на латвійска-бальшавіцкі фронт, але не выключыў, што яны возьмуць удзел у баях супраць войск Бермонт-Авалава[128]. Беларускія дзеячы бачылі патрэбу ў падпісанні беларуска-латвійскай вайсковай канвенцыі. Урад БНР даручыў К. Езавітаву і К. Дуж-Душэўскаму заданне пачаць перамовы з латвійскім урадам у справе заключэння дадзенага пагаднення[129]. На сходзе прадстаўнікоў ураду БНР 17 лістапада 1919 г. Я. Чарапук паведаміў, што латвійскі ўрад даў прынцыповую згоду на стварэнне беларускіх фарміраванняў у латвійскім войску[130]. Два дні пазней ён жа пісаў Радзе міністраў БНР, што крыніцай папаўнення арміі могуць быць балахоўцы (2 тыс.), беларусы, мабілізаваныя ў латвійскую, фінскую і эстонскую арміі (2 тыс.), а таксама беларусы, пераведзеныя з арміі ген. П. Юдзеніча. На думку беларускага палітыка гэтых аддзелаў хапіла б, каб вызваліць ад бальшавікоў Полацк. Ён раіў ураду актывізаваць супрацоўніцтва з латышамі, эстонцамі і фінамі[131]. Палітык лічыў, што добраахвотнікаў у беларускае войска хапала і трэба толькі "кінуць кліч". Ён браў пад увагу варыянт пошуку добраахвотнікаў

Аляксей Крум, ураджэнец Рыгі, бацькі якога паходзілі з Лепельскага павета. Гэты чалавек быў ветэранам І сусветнай вайны, потым служыў у Чырвонай арміі, але перайшоў у армію ген. М. Юдзеніча, каб у кастрычніку 1919 г. апынуцца ў латвійскім войску. У другой палове 1920 г. ён звярнуўся ў ВДМ з прапановай уласных паслуг вайскоўца (НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 110, л. 68).

[127] А. Ціхаміраў, *Беларусь у сістэме міжнародных адносін перыяду паслваеннага ўладкавання Еўропы і польска-савецкай вайны (1918–1921 гг.)*, Менск 2003, с. 165.

[128] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 143, л. 6.

[129] АБНР, т. 1, кн. 1, с. 471–473; LCVA, f. 582, ap. 2, b. 32, l. 13–14, 16–18.

[130] АБНР, т. 1, кн. 1, с. 499.

[131] Ю. Юркевіч, *Стварэнне і дзейнасць Асобнага атрада БНР у Балтыі*..., с. 104–105; LCVA, f. 582, ap. 2, b. 32, l. 37.

нават сярод ваеннапалонных з арміі П. Бермонт-Авалава, а таксама стварэнне асобнага габрэйскага палка з жыхароў Рыгі[132].

Аднак энтузіязм быў заўчасны, бо латвійскі бок не пагадзіўся на стварэнне беларускіх аддзелаў у складзе сваіх узброеных сіл. Дзеячы ВДМ БНР мусілі абмежавацца спробамі выкарыстаць ужо існыя часткі балахоўцаў. На пачатку снежня 1919 г. К. Езавітаў пачаў перамовы з латвійскім урадам наконт далейшага лёсу Асобнага атрада БНР. Беларускі дзеяч звярнуўся да кіраўніка МЗС Латвіі з прапановай узяць аддзел пад латвійскае камандаванне дзеля яго выкарыстання на латвійска-бальшавіцкім фронце. На той час балахоўцы часткова ўжо займалі пазіцыі на тэрыторыі Латвіі, у ваколіцах Алукснэ, дзе іх размясціла камандаванне эстонскай арміі. 10 снежня кіраўнік ВДМ прапанаваў латышам прыняць атрад пад сваё камандаванне ў якасці саюзнай арміі і даўкамплектаваць шляхам мабілізацыі грамадзян БНР у Латвіі. Аднак улады ў Рызе не спяшаліся дазваляць мабілізацыю на сваёй тэрыторыі, асцерагаючыся, што беларускія аддзелы могуць стварыць пагрозу для латышоў. Галоўнакамандуючы латвійскай арміяй ген. Яніс Балодзіс (*Jānis Balodis*) у размове з К. Езавітавым выказаў шкадаванне, што не можа дапамагчы беларусам з прычыны ўнутрыпалітычнай і знешнепалітычнай сітуацыі ў рэгіёне[133]. 11 снежня 1919 г. кіраўнік латвійскага МЗС З. Мееровіцс ад імя свайго ўрада адмовіўся даць дазвол на дыслакацыю балахоўцаў у Латвіі, адначасова выказаўшы згоду на пераход аддзела з Эстоніі праз латвійскую тэрыторыю ў Беларусь[134]. Пра надзеі беларускіх дзеячаў, звязаныя з аддзелам балахоўцаў, сведчыць ліст кіраўніка ВДМ ген. С. Булак-Балаховічу 1 студзеня 1920 г.: "*Пачынайце патроху наладжваць добрыя зносіны з латышамі: можа прыйдзецца працаваць з імі разам. Памятайце, што Вам трэба будзе спускацца бліжэй да Дзвіны (...) Аб Вас ужо ведае ўся беларуская, латышская і нямецкая прэса. Усе ўспамінаюць вельмі прыхільна. Хутка будзе трубіць французская, ангельская і амерыканская. Моцна трымайцесь, як бы цяжка ні было. Ваш Атрад павінен прыйсці і на Бацькаўшчыну з такім жа прымерам, як Атрад Галера ў Польшчу*"[135].

Нягледзячы на тое, што ўлады ў Рызе не спяшаліся выходзіць насустрач беларусам, К. Езавітаў не пераставаў бамбардаваць латвійскі бок просьбамі ўзяць балахоўцаў на службу. 13 студзеня 1920 г. кіраўнік ВДМ зноў звярнуўся да міністра замежных спраў Латвіі з прапановай звярнуць увагу на аддзел, які знаходзіўся на ўтрыманні эстонскага войска і не меў

---

[132] Ю. Юркевіч, *Стварэнне і дзейнасць Асобнага атрада БНР у Балтыі*..., с. 137–138.

[133] E. Jekabsons, *Stosunki między Łotwą i Białoruską Republiką Ludową w latach 1919–1921*, s. 51.

[134] Ю. Юркевіч, *Стварэнне і дзейнасць Асобнага атрада БНР у Балтыі*..., с. 109, 111–112; E. Jekabsons, *Stosunki między Łotwą i Białoruską Republiką Ludową w latach 1919–1921*..., s. 53.

[135] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 101, л. 34–35.

магчымасці весці баявых дзеянняў супраць савецкіх войск[136]. У рэшце рэшт латвійскі бок пагадзіўся, каб балахоўцы знаходзіліся на тэрыторыі Латвіі, аднак не пагадзіўся на мабілізацыю і аператыўнае падпарадкаванне латвійскаму камандаванню[137]. Тым часам маральны дух балахоўцаў падаў, на гэта ўплывала нявызначанасць перспектыў і адсутнасць сродкаў. Па словах К. Езавітава, большасць вайскоўцаў не мела грошай і амаль галадала. 29 студзеня 1920 г. кіраўнік ВДМ пільна выслаў кур'ера Міхася Ляховіча па грошы ў Міністэрства фінансаў БНР. Беларускі дзеяч прасіў выдаць 700 тыс. марак на патрэбы ВДМ і 100 тыс. марак – для Асобнага атрада БНР[138]. Ён наступным чынам абгрунтоўваў патрэбу атрымання вышэйзгаданай сумы: "*Вайскова-Дыпламатычная Місія БНР адзіная з Місій магушчая веска казаць сваё слова, бо яна апіраецца на аружную сілу Асобнага Атрада БНР і добра звязана з усімі Іназемнымі Дзяржавамі, – знаходзіцца ў страшэнна цяжкіх грашовых варунках, якія прымушаюць мяне, калі я не атрымаю грошай у працягу студзеня, спыніць працу ў Латвіі, Эстыі і Фінляндыі. Гэта раўнасільна аканчацельнаму знічтажэнню Беларускай працы*"[139]. Каб супакоіць эмоцыі сярод балахоўцаў і ўмацаваць іх камандзіра ў рашэнні служыць беларускай справе, К. Езавітаў запэўніваў яго, што беларусы знойдуць грошы на ўтрыманне Асобнага атрада БНР. Адначасова ён не шкадаваў кампліментаў на адрас генерала: "*Вас чакаюць беларусы як праўдзівага 'бацьку-ізбавіцеля' і ўжо зроблена ўсё, каб падтрымаць Ваш Атрад грашыма (...) Роль Вашая вельмі вялікая ў нашай гісторыі і нашай справе, а таму мы зробім усё, каб Ваша імя грымела на Бацькаўшчыне. Вы ж трымайцеся так, каб ніводзін правакатар не мог сказаць, што расейскі генерал і глядзіце больш у Петраград і Масквy, чым у родны Полацк і Менск*"[140].

На далейшы ход справы мелі ўплыў падзеі на фронце. Напрыканцы студзеня 1920 г. латвійскія войскі перанялі ад эстонцаў прамежак фронту, які займалі балахоўцы. Прадстаўнік штабу латвійскай арміі паручнік Яніс Гова сцвярджаў, што жыхары Алукснэ былі больш задаволеныя знаходжаннем аддзела БНР, чым эстонскіх аддзелаў, якія раней кватаравалі ў горадзе. Каб падтрымліваць парадак, камандаванне аддзела ўвяло суровыя пакаранні за злачынствы. Тым часам, 2 лютага 1920 г. у Тарту было падпісанае савецка-эстонскае перамір'е, а значыць Асобны атрад БНР мусіў пакінуць Эстонію. Кастусь Езавітаў не перастаў рабіць захады, каб перавесці балахоўцаў

---

[136] LVVA, 2574 f., 2 ap., 3 l., 31–33 lpp.

[137] Ю. Юркевіч, *Стварэнне і дзейнасць Асобнага атрада БНР у Балтыі*..., с. 109, 111–112; E. Jekabsons, *Stosunki między Łotwą i Białoruską Republiką Ludową w latach 1919–1921*..., s. 53.

[138] Ю. Юркевіч, *Стварэнне і дзейнасць Асобнага атрада БНР у Балтыі*..., с. 147.

[139] АБНР, т. 1, кн. 1, с. 639.

[140] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 101, л. 255.

у паўднёва-ўсходнюю Латвію, адкуль яны маглі пачаць наступ на Бацькаўшчыну[141]. Кіраўнік ВДМ двойчы звяртаўся да латвійскага ўрада з просьбай дазволіць пераход балахоўцаў на тэрыторыю колішняй Віцебскай губерні, якая знаходзілася пад супольным польска-латвійскім кантролем, але латышы не далі на гэта згоды[142].

Задума К. Езавітава папоўніць аддзел новымі сіламі і перакінуць у Беларусь, каб апярэдзіць польскія войскі, аказалася мрояй. Латышы рыхтаваліся да мірных перамоў з Савецкай Расіяй, таму не былі зацікаўлены ў далейшым знаходжанні антысавецкіх узброеных фарміраванняў на сваёй тэрыторыі. У гэтай сітуацыі 8 лютага 1920 г. К. Езавітаў звярнуўся да Юзафа Пілсудскага з просьбай вылучыць Асобнаму атраду войскаў БНР прамежак фронту на левым крыле польскіх войскаў. Беларускі дзеяч спасылаўся на дэкрэт начальніка польскай дзяржавы пра фарміраванне беларускага войска і разлічваў на тое, што ўрад БНР разам з Ю. Пілсудскім, палкоўнікам Хасанам Канапацкім і ген. С. Булак-Балаховічам узгодняць пераход атрада на польскую службу[143]. Кіраўнік ВДМ разлічваў, што канчатковае рашэнне пра выкарыстанне аддзела Балаховіча будзе прынята супольна ўрадам БНР і Ю. Пілсудскім. Верагодна, ліст К. Езавітава быў уручаны Я. Чарапуком прадстаўніку польскай місіі ў Рызе Б. Боўфалу. Крок К. Езавітава не меў вялікага значэння, бо С. Булак-Балаховіч і сам вёў перамовы з польскім камандаваннем наконт пераходу на іх бок. Паводле пазнейшых сведчанняў К. Езавітава, пры яго ўдзеле ў Рызе адбылася сустрэча прадстаўніка Асобнага атрада БНР палкоўніка Мінгрэльскага і В. Ластоўскага, падчас якой прэм'ер БНР патлумачыў, што беларускі ўрад у дадзены момант не мае сродкаў на ўтрыманне балахоўцаў. Беларускі палітык раіў С. Балаховічу прыняць прапанову палякаў мяркуючы, што пры спрыяльных умовах урад БНР здолее выкарыстаць балахоўцаў[144]. На пачатку сакавіка аддзел балахоўцаў быў прыняты Ю. Пілсудскім на польскую службу і пераправіўся ў Даўгаўпілс, адкуль быў накіраваны ў Берасце дзеля рэарганізацыі і папаўнення. Палякі сфарміравалі з балахоўцаў Саюзную добраахвотніцкую армію, якая была скіраваная ва Украіну, дзе тады разгортваўся галоўны наступ на пазіцыі Чырвонай арміі. У выніку Асобны атрад войскаў БНР быў страчаны для беларускай справы. Кастусь Езавітаў прызнаваў, што прычынай гэтай паразы было безграшоўе. Ведаючы, што з адыходам балахоўцаў у Беларусь і пераходам пад польскае кіраўніцтва вайскоўцы трапяць пад чужыя ўплывы, К. Езавітаў

---

[141] *Балахоўцы. Сведчанні. Дакументы. Даследаванні*, 2-е выданне, пераклад, прадмова і каментары А. Вашкевіч, А. Чарнякевіч, Ю. Юркевіч, Смаленск 2014, с. 112, 354.

[142] Ю. Юркевіч, *Стварэнне і дзейнасць Асобнага атрада БНР у Балтыі...*, с. 112.

[143] *За дзяржаўную незалежнасьць Беларусі*, Лёндан 1960, с. 50–51.

[144] LYA, K-l, ap. 58, b. P-7427, Пратакол допытаў К. Езавітава, 19 II 1946 г.

заклікаў кіраўніцтва Беларускай вайсковай камісіі заапекавацца балахоўцамі, асабліва афіцэрамі, каб атраду "не даць загінуць"[145]. Адначасова прэс-бюро ВДМ паведаміла, што Асобны атрад БНР быў перакінуты ў Беларусь на падставе дамовы паміж С. Булак-Балаховічам і польскім камандаваннем, хоць у рэальнасці генерал зрабіў гэта без згоды і ведама палітыкаў БНР[146].

Можна меркаваць, што на стаўленне латвійскіх улад да стварэння беларускіх вайсковых аддзелаў у Балтыі ўплывала пазіцыя Польшчы. Польскі дыпламатычны прадстаўнік у Рызе скептычна ацэньваў мілітарныя і палітычныя магчымасці палітыкаў БНР. Ён сцвярджаў, што БНР пазбаўлена галоўных умоў існавання: тэрыторыі, насельніцтва і вышэйшай улады[147]. У адказ 4 студзеня 1920 г. прэс-бюро ВДМ БНР заявіла, што разглядае гэтыя словы як праяву варожых адносін Польшчы да Беларусі. Улады ў Рызе намагаліся захаваць нейтральнасць у польска-беларускіх справах, каб не быць абвінавачанымі ў падтрымцы аднаго з бакоў. 17 красавіка 1920 г. Б. Боўфал у рапарце адзначаў, што латвійскі ўрад ставіцца да беларускай справы памяркоўна, але глядзіць скрозь пальцы на антыпольскую агітацыю, якой займаецца ВДМ БНР. Польскі дыпламат быў перакананы, што шмат "шпіёнаў Езавітава" з латвійскімі пашпартамі кіруецца ў акупаваную польскімі войскамі Беларусь[148].

Да складаных момантаў у беларуска-латвійскіх адносінах належала пытанне дзяржаўнай мяжы, якая праходзіла праз шматэтнічную Латгалію. Найбуйнейшым горадам рэгіёна, а таксама камунікацыйным, прамысловым і гандлёвым цэнтрам быў Даўгаўпілс. Невыпадкова латвійскі бок імкнуўся, каб ён апынуўся ў межах Латвіі. Але і дзеячы БНР былі не супраць бачыць яго ў межах сваёй дзяржавы. У другой палове лістапада 1919 г. латвійская прэса інфармавала, што спрэчныя тэрыторыі не павінны быць прадметам непаразуменняў, паколькі абодва бакі дэкларуюць жаданне вырашыць пытанне дыпламатычным шляхам, а ў выпадку неабходнасці – з дапамогай плебісцыту або праз пасрэдніцтва міжнароднага арбітражу[149]. Вызначэнне дзяржаўнай мяжы патрабавала двухбаковага пагаднення. Беларускія дзеячы кіраваліся этнаграфічным прынцыпам і давалі зразумець, што будуць патрабаваць, каб частка Даўгаўпілскага і Лудзенскага паветаў былі прызнаныя беларускімі. З думкай пра будучыя перамовы з латышамі К. Езавітаў падрыхтаваў уступны накід мяжы, якая крыху рознілася ад той, што была пазначана на мапе БНР. 23 лютага 1920 г. МЗС Латвіі прапанавала пачаць перамовы наконт

---

[145] Ю. Юркевіч, *Стварэнне і дзейнасць Асобнага атрада БНР у Балтыі*..., с. 152.

[146] E. Jekabsons, *Stosunki między Łotwą i Białoruską Republiką Ludową w latach 1919–1921*..., s. 57.

[147] Ю. Юркевіч, *Стварэнне і дзейнасць Асобнага атрада БНР у Балтыі*..., с. 96.

[148] E. Jekabsons, *Stosunki między Łotwą i Białoruską Republiką Ludową w latach 1919–1921*..., s. 57–58.

[149] E. Jekabsons, *Stosunki między Łotwą i Białoruską Republiką Ludową w latach 1919–1921*..., s. 52.

спрэчных абшараў. Канкрэтныя прапановы адносна лініі мяжы павінна была распрацаваць адмысловая латвійска-беларуская дзяржаўная камісія. Кіраўнік ВДМ БНР звярнуўся да прэм'ера А. Луцкевіча з просьбай даслаць адпаведныя ўрадавыя інструкцыі на перамовы з латвійскім бокам і даць мандат на працу ў памежнай камісіі. Акрамя К. Езавітава ў склад камісіі з беларускага боку ўвайшлі Б. Шымковіч, Р. Казячы і Я. Чарапук[150]. Апошні быў туды камандзіраваны кіраўніком ВДМ 11 сакавіка 1920 г. Акрамя таго, К. Езавітаў падрыхтаваў праект дэлімітацыі беларуска-латышскай мяжы. Згодна з яго прапановамі, мяжа з Латвіяй пачыналася на поўначы ў ваколіцах Корсаўкі на Лудзеншчыне. Пры гэтым мястэчка Лудза заставалася на латвійскім баку, але большая частка паўднёвага абшару павета павінна была апынуцца ў складзе Беларусі. Далей мяжа праходзіла ўздоўж усходняй і паўднёвай мяжы колішняга Рэжыцкага павета, які заставаўся ў Латвіі. Тым часам, у межах БНР мусіў апынуцца Даўгаўпілс і ўся паўднёвая Даўгаўпілшчына[151]. Латышы палічылі прэтэнзіі беларусаў за перабольшаныя. З прычыны няпэўнай сітуацыі вакол незалежнасці Беларусі, латвійскі бок не спяшаўся высылаць прадстаўнікоў у склад камісіі, і ў выніку яна не адразу пачала працу[152].

Згодна з прапановай кіраўніка МЗС Латвіі, памежная камісія сабралася толькі 20 сакавіка 1920 г.[153] Яе першае пасяджэнне адбылося ў сядзібе МЗС Латвіі. Удзельнікамі з латвійскага боку былі Юрыс Фельдманіс і Альбертс Швабэ. Пасяджэнне прайшло ў сяброўскай атмасферы, але не дало канкрэтных вынікаў. Латвійская дэлегацыя пагаджалася, што ў аснову дзяржаўнай мяжы павінен быць пакладзены этнаграфічны фактар, але дапускала адхіленні ад яго са стратэгічных або эканамічных меркаванняў. Латышы далі зразумець, што ў межах іх краіны павінен застацца Даўгаўпілс. Беларусы падкрэслілі, што не вітаюць такое рашэнне. Беларуская дэлегацыя кіравалася інструкцыяй, атрыманай ад урада БНР. Беларускі бок лічыў, што на выпадак рознагалоссяў наконт спрэчных тэрыторый пытанне павінна быць вырашана шляхам плебісцыту. У выпадку нязгоды справа перадавалася на разгляд міжнароднай супольнасці. У выніку было вырашана, што беларуская дэлегацыя падрыхтуе ўласнае бачанне праблемы, якое потым будзе супольна абмеркавана[154].

Міжнародная і мілітарная сітуацыя не спрыяла, аднак, працягу перамоў. Справа дзяржаўнай прыналежнасці Даўгаўпілса і ўсёй Латгаліі была вырашана

---

[150] НАРБ. Ф. 325. Воп. 1. Спр. 72. Л. 68–70; LVVA, 2574 f., 2 ap., 3 l., 91 lp.

[151] Д. Міхалюк, *Беларуская народная рэспубліка ў 1918–1920 гг. Ля вытокаў беларускай дзяржаўнасці*, Смаленск 2016, с. 225–226, 410.

[152] E. Jekabsons, *Stosunki między Łotwą i Białoruską Republiką Ludową w latach 1919–1921...*, s. 58.

[153] АБНР, т. 1, кн. 1, с. 704; НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 72, л. 62.

[154] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 114, л. 2–6, 8.

без удзелу беларусаў. Варта прыгадаць, што ў перыяд, калі латвійскі і беларускі бакі рыхтаваліся да перамоў, лёс самой Латвіі, а тым больш Беларусі, заставаўся няпэўны, а Латгалія знаходзілася ў руках бальшавікоў. Апошнія занялі яе яшчэ ў снежні 1918 г., калі адтуль эвакуіраваліся апошнія аддзелы нямецкіх войскаў. 30 снежня 1919 г. была падпісаная польска-латвійская патаемная дамова пра супольныя дзеянні па вызваленні Латгаліі. 3 студзеня 1920 г. польскія аддзелы пад камандаваннем ген. Эдварда Рыдз-Сміглага занялі Даўгаўпілс. 16 студзеня латвійскі бок дазволіў палякам заняць усю Латгалію. Латвійскія войскі не спрабавалі ўзяць горад, бо былі занятыя змаганнем з войскамі Бермонт-Авалава. У ліпені 1920 г. палякі былі вымушаны пакінуць Даўгаўпілс падчас агульнага адыходу польскіх войск і бальшавіцкага контрнаступу ў Беларусі і Украіне. Яшчэ раней польскі бок адмовіўся ад прэтэнзій на Латгалію ўключна з Даўгаўпілсам на карысць латвійскай дзяржавы. Гэта было свядомае рашэнне Ю. Пілсудскага, які, шукаючы саюзнікаў на Усходзе, намагаўся заручыцца падтрымкай Латвіі. У сваю чаргу бальшавікі, таксама кіруючыся палітычным разлікам, не аспрэчвалі права Рыгі на рэгіён, перадаўшы яго Латвіі ўлетку 1920 г. Канчаткова гэта замацавала мірная дамова паміж Латвіяй і Савецкай Расіяй (11 жніўня 1920 г.). Такім чынам, Даўгаўпілс і Латгалія сталі часткай Латвійскай Рэспублікі і гэтага не аспрэчылі ні Варшава, ні Масква. У той сітуацыі перамовы з неіснуючай БНР не мелі сэнсу.

Падсумоўваючы міжнародныя ініцыятывы ВДМ, можна зрабіць выснову, што яны скончыліся паразай. Разам з тым, нельга сказаць, што адказнасць за гэта нясуць беларускія дзеячы ў Латвіі. Вынік дыпламатычнай дзейнасці ВДМ залежаў ад сітуацыі, у якой апынуўся беларускі незалежніцкі лагер.

На заканчэнне разгляду дзейнасці Вайсква-дыпламатычнай місіі варта падкрэсліць, што на яе працу паўплываў раскол у Радзе і ўрадзе БНР у снежні 1919 г. у Менску. Выбіраючы палітычнага хаўрусніка, беларускія дзеячы вагаліся паміж Літвой і Польшчай. Палітычны разлік і міжнародная кан'юнктура патрабавалі ад беларускіх незалежнікаў зрабіць выбар на карысць Коўна ці Варшавы. Абапірацца на абодва бакі было складана, бо літоўцы і палякі варагавалі, а каменем нязгоды было пытанне дзяржаўнай прыналежнасці Вільні і Віленшчыны. Частка беларускіх палітыкаў (Вацлаў Ластоўскі, Пётра Крачэўскі, Язэп Варонка і інш.) трымаліся пралітоўскай пазіцыі. Тым часам, іншыя (Браніслаў Тарашкевіч, Павел Аляксюк, Аркадзь Смоліч і інш.) схіляліся да супрацоўніцтва з Польшчай. Апошніх падтрымаў прэм'ер А. Луцкевіч. Ён з цяжкім сэрцам развітваўся з ідэяй літоўска-беларускага хаўрусу, бо лічыў, што, у адрозненне ад Коўна, Варшава з'яўляецца рэальным палітычным гульцом у рэгіёне, ад якога ў многім будзе залежаць далейшы лёс беларускіх земляў. Расчараванне беларускіх палітыкаў пазіцыяй Варшавы прывяло да расколу ў Радзе БНР. Яго вынікам стала стварэнне

Найвышэйшай Рады БНР на чале з Язэпам Лёсікам і падпарадкаваным ёй урадам А. Луцкевіча. У апазіцыі засталася Народная Рада БНР на чале з Пётрам Крачэўскім. 14 снежня 1919 г. падчас пасяджэння Рады БНР быў створаны новы ўрад на чале з В. Ластоўскім, у якім К. Езавітаў завочна атрымаў пасаду міністра вайсковых спраў. Кіраўнік ВДМ не прысутнічаў у Менску, таму не меў падрабязнай інфармацыі пра тое, што адбылося ў беларускай сталіцы. Абодва лагеры, якія ўзніклі ў выніку расколу Рады БНР, спрабавалі перацягнуць на свой бок дыпламатычныя структуры БНР у Рызе. Гэта можна было зрабіць шляхам уплыву на К. Езавітава, які з'яўляўся ключавой фігурай сярод беларусаў Балтыі. Нягледзячы на тое, што К. Езавітаў не падзяляў прапольскага курсу А. Луцкевіча, доўгі час ён намагаўся захоўваць лаяльнасць да былога прэм'ера. Менавіта А. Луцкевічу шэф ВДМ БНР працягваў накіроўваць рапарты і справаздачы пра сваю дзейнасць[155]. Імаверна, гэта было выклікана тым, што К. Езавітаў да канца не арыентаваўся ў падзеях на Бацькаўшчыне. 5 лютага 1920 г. ён атрымаў тэлеграму ад П. Крачэўскага, у якой апошні інфармаваў пра снежаньскую менскую канферэнцыю і змены, якія на ёй адбыліся. У адказ К. Езавітаў накіраваў у Берлін кур'ера, які, аднак, не атрымаў новых інструкцый. У гэтых абставінах кіраўнік ВДМ БНР працягваў падтрымліваць адносіны з прэм'ерам А. Луцкевічам[156].

14 студзеня 1920 г., спасылаючыся на латвійскага амбасадара ў Варшаве, А. Луцкевіч паінфармаваў А. Смоліча, што К. Езавітаў і К. Дуж-Душэўскі выступілі супраць "менскай авантуры"[157]. Каб здабыць давер кіраўніка ВДМ, 8 лютага 1920 г. Найвышэйшая Рада БНР ухваліла рашэнне аб наданні К. Езавітаву годнасці генерал-маёра[158]. 11 лютага 1920 г. К. Езавітаў скіраваў ліст старшыні Рады міністраў БНР, у якім дзякаваў за тлумачэнне менскіх падзей і паведамляў, што паінфармаваў пра іх прыхільныя беларусам грамадска-палітычныя сілы ў Латвіі[159]. Тым часам, 24 студзеня 1920 г. ліст кіраўніку ВДМ накіраваў В. Ластоўскі, які апісаў снежаньскія падзеі ў Менску як акт недаверу да прэм'ера А. Луцкевіча. Аўтар вінаваціў Найвышэйшую Раду ў даносах палякам, вынікам якіх, нібыта, быў арышт сяброў Прэзідыума Рады і ўрада БНР. Палітык запэўніваў, што яго ўрад будзе рашуча змагацца "*з нацыянальнай і дзяржаўнай здрадай, якая вядзе нас не да Незалежнасці а да нацыянальна-культурнай аўтаноміі ў Польшчы*"[160].

---

[155] Д. Міхалюк, *Беларуская народная рэспубліка ў 1918–1920 гг. Ля вытокаў беларускай дзяржаўнасці*, Смаленск 2016, с. 423.

[156] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 46, л. 83 зв.–84.

[157] АБНР, т. 1, кн. 1, с. 603.

[158] АБНР, т. 1, кн. 1, с. 654.

[159] LCVA, f. 582, ap. 2, b. 32, l. 111.

[160] АБНР, т. 1, кн. 1, с. 623.

З часам кіраўнік ВДМ усё больш быў незадаволены супрацоўніцтвам з А. Луцкевічам і схіляўся на бок В. Ластоўскага. Ліст К. Езавітава А. Луцкевічу 21 лютага 1920 г. быў перапоўнены адчаем і прэтэнзіямі: "*Калі Вы тамака зробіце належныя крокі, але не праз трэціх ліц і не з чорнага ходу, як гэта ў Вас заўсёды рабілася, дык мае кур'еры не павінны будуць мяняць мае дыпламатычныя пашпарты на ўсялякія паліцэйскія паперы, а вы самі будзеце Месіяй, а не грамадзянскім прыватным гуртком, пражываючым у месце з Божай ласкі*"[161]. Днём раней ён напісаў ліст П. Крачэўскаму, у якім раіў зрабіць усё магчымае, каб пазыка ад ураду УНР не трапіла ў рукі А. Луцкевіча[162]. Можна меркаваць, што да ахалоджання адносін К. Езавітава і А. Луцкевіча спрычынілася няздатнасць апошняга вырашыць грашовыя цяжкасці ВДМ[163]. У рапарце (12 сакавіка 1920 г.) К. Езавітаў жаліўся А. Луцкевічу на адсутнасць інфармацыі ад яго ўраду пра адносіны прэм'ера з "рэвалюцыйным урадам БНР"[164]. У гэтым жа рапарце ён прасіў даць яму паўнамоцтвы на стварэнне Гандлёвай палаты, а таксама даручыць кіраванне беларускай дэлегацыяй на Канферэнцыі балтыйскіх дзяржаў. Разам з тым, ёсць падставы меркаваць, што кіраўнік ВДМ ад самага пачатку сімпатызаваў "рэвалюцыйнаму" ўраду Ластоўскага. Не апошнюю ролю сыграла асабістая антыпатыя К. Езавітава да палякаў[165].

---

[161] АБНР, т. 1, кн. 1, с. 676.

[162] АБНР, т. 1, кн. 1, с. 675.

[163] У адным з лістоў А. Луцкевічу кіраўнік ВДМ БНР пісаў: "*Вы прыслалі ўсяго 10.000 марак, што не толькі мяне не спасае, але і не дае перадышкі. Зноў паўтараю, што я павінен буду спыніць тутака працу і ўцякаць без аглядкі калі не атрымаю праз гэтага кур'ера хаця бы 50.000 марак*". АБНР, т. 1, кн. 1, с. 676.

[164] Кастусь Езавітаў пісаў наступнае: "*Мне здаецца, што оба Урады павінны зразумець, што вайна паміж імі была бы на карысць нашым ворагам і на пагібель Беларускай справы, а таму, ведучы кожны сваю лінію, яны павінны шукаць шляхоў да паразумення і спосабаў не шкодзіць, а дапамагаць друг другу ў агульнай працы. Стоячы на гэтым поглядзе, я прапанаваў сваім партыйным таварышам, эсэрам і іншым Беларускім партыям, кінуць узаемную і вельмі брудную лаянку, узаемнае абліванне друг друга памыямі і ўзаемныя падазрэнні і назначэнні ў якойсьці ізмене ці здрадзе. Расколам, сілай немагчыма дапамагчы справе. Калі Вы згодны са мной у гэтым пункце, дык мы маглі бы з Вамі абгаварыць канкрэтныя крокі да паразуменьня*". НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 72, л. 33 зв.

[165] У лютым 1920 г. пад уплывам антыпольскіх заяў К. Езавітава ў латвійскай прэсе з'явілася некалькі артыкулаў прысвечаных сітуацыі ў Беларусі. Аўтары звярталі ўвагу на рабаўніцкія і захопніцкія дзеянні палякаў у дачыненні да беларусаў падкрэсліваючы, што яны выклікалі масавую незадаволенасць насельніцтва і прадстаўнікоў палітычных эліт. Пры гэтым адзначалася, што толькі частка беларускіх палітыкаў – правых і часткова цэнтра – супрацоўнічае з акупантамі. Сведчаннем гэтага быў паварот у арыентацыі беларускага лагера, які адбыўся на пасяджэнні Рады БНР 19 снежня 1919 г. у Менску, калі большасць палітыкаў выказала недавер да палітыкі ўраду А. Луцкевіча, які працягваў прапольскую лінію. Акрамя таго, звярталася ўвага на арышт "рэвалюцыйнага" Прэзідыума Рады БНР і стварэнне А. Луцкевічам "рады пяці", якая,

Тым часам, В. Ластоўскі працягваў схіляць кіраўніка ВДМ БНР на свой бок. 5 красавіка 1920 г. ён выдаў грамату аб пацвярджэнні паўнамоцтваў ВДМ прадстаўляць і абараняць інтарэсы беларускага народа ў Эстоніі і Латвіі[166]. Верагодна, К. Езавітаў не адчуваў сябе камфортна ў сітуацыі ўнутранага змагання, якое раз'ядноўвала беларускі незалежніцкі лагер. 10 траўня 1920 г. ён накіраваў В. Ластоўскаму рапарт, у якім прасіў вызваліць яго ад пасады кіраўніка Вайскова-дыпламатычнай місіі. Просьбу ён тлумачыў наступным чынам: "*Па незалежных ад мяне варунках праца мая, як прадстаўніка Беларускай Народнай Рэспублікі, не даходзіць тых мэтаў якія я для сябе стаўлю. Не маючы магчымасці ўзяць на сябе адпаведнасць за няўдачы, якія к таму ж робяцца і не па маёй віне, прашу Вас, Грамадзянін Міністр, звольніць мяне з займанага мной становішча Шэфа Вайскова-Дыпламатычнай Місіі ў Латвіі і Эстыі*"[167]. Аднак прэм'ер пераканаў К. Езавітава застацца на пасадзе. Пэўны недавер паміж Ластоўскім і Езавітавым, аднак, існаваў. Прэм'ер сачыў за кожным крокам кіраўніка ВДМ і цікавіўся сумленнасцю выканання абавязкаў. 22 чэрвеня 1920 г. В. Ластоўскі накіраваў К. Езавітаву ліст, у якім патрабаваў паведаміць, калі і ад каго кіраўнік ВДМ даведаўся пра стварэнне 19 снежня 1919 г. новага ўрада, а таксама як доўга і на падставе чаго ён падтрымліваў зносіны з "былым урадам Луцкевіча"[168]. У адказ кіраўнік ВДМ тлумачыў, што працяглы час быў пазбаўлены вартай даверу інфармацыі пра падзеі на Бацькаўшчыне, аднак лічыў неабходным выконваць свае абавязкі ў згодзе з А. Луцкевічам да моманту высвятлення справы, каб не нашкодзіць беларускім дзяржаўным інтарэсам у Латвіі[169]. 27 жніўня 1920 г. В. Ластоўскі паінфармаваў К. Езавітава, што ён незадаволены адсутнасцю гадавой справаздачы ВДМ БНР, у тым ліку яе фінансавай часткі. У сувязі з гэтым прэм'ер вырашыў склікаць Рэвізійную камісію дзеля верыфікацыі гадавой дзейнасці місіі[170]. Але, нягледзячы на вышэйзгаданыя непаразуменні,

---

нібыта, ставіла за мэту далучыць Беларусь да Польшчы. Аўтары канстатавалі, што часовы ўздым беларускіх рэвалюцыйных настрояў быў задушаны насуперак волі народа. Некаторыя выданні пісалі, што нават сярод зацятых прыхільнікаў супрацоўніцтва з Польшчай расце абурэнне. У іншым артыкуле адзначалася, што А. Луцкевіч загадаў палякам арыштаваць сваіх апанентаў. У іншым месцы адзначалася, што "рэвалюцыйны" ўрад В. Ластоўскага пакінуў Беларусь, каб працягваць змаганне супраць польскіх планаў анексіі Беларусі. ERA, f. 957, n. 11, s. 259, l. 7–12.

[166] АБНР, к. 1, ч. 1, с. 714; ERA, f. 957, n. 8, s. 63, l. 11.

[167] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 46, л. 43.

[168] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 46, л. 82.

[169] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 46, л. 82–83 зв.

[170] Кастусь Езавітаў наступным чынам пракаментаваў крок В. Ластоўскага: "*Вельмі цікавая папера. Найбольш цікава што на ёй дэманстратыўна фігуруе фамілія гр. Валькевіча, зусім не патрэбная ні па зместу паперш, ні па становішчу працы, злажыўшамуся пасля майго рапарту (...) Не разумею, чаму ад мяне не патрабавалі адчоту адразу ж па прыездзе, а потым, калі я папрасіў рэвізіі*". НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 46, л. 117.

Вайскова-дыпламатычная місія БНР у Балтыі працягвала дзейнасць у рэчышчы палітыкі ўраду В. Ластоўскага.

Консульства БНР у Рызе

Асобнай старонкай беларускай прысутнасці ў Латвіі ў разгляданы перыяд з'яўляецца дзейнасць консульскай службы БНР. Як ужо адзначалася раней, беларускае консульства было адчынена ў Рызе адразу пасля прыезду сюды К. Цярэшчанкі, які адначасова выконваў абавязкі першага консула[171]. 12 жніўня 1919 г. К. Цярэшчанка перадаў консульству ў Рызе 1500 нямецкіх марак на арганізацыйныя выдаткі[172]. 17 жніўня 1919 г. беларускі консул атрымаў ад міністра замежных спраў Латвіі афіцыйнае прызнанне і візу[173]. У верасні консульства атрымала сядзібу ў будынку па адрасе *Mazā Pils iela 3/3*. 26 верасня 1919 г. над уваходам у будынак консульства БНР у Рызе быў урачыста вывешаны бела-чырвона-белы сцяг. Вось якім чынам падзею апісаў карэспандэнт газеты "Сегодня": "*Учора па Малой Замкавай вуліцы № 3 каля дома, дзе месціцца беларускі рыжскі прадстаўнік, быў падняты новы для Рыгі беларускі нацыянальны сцяг, складзены з трох паралельных палос бела-чырвона-белага колераў*"[174]. Ад студзеня 1920 г. консульства месцілася па адрасе *Kalpaka bulvāris 7/3*. Пасля ад'езду К. Цярэшчанкі з Рыгі новым консулам быў прызначаны штабс-капітан Барыс Шымковіч. На гэтай пасадзе яго змяніў Рыгор Казячы, ранейшы сакратар консульства. З 23 чэрвеня 1920 г. ён лічыўся в.а. консула, нягледзячы на тое, што фактычна прыступіў да выканання абавязкаў консула яшчэ 28 красавіка. На пачатку 1920 г. персанал консульства складаўся з 5 штатных супрацоўнікаў і 4 пазаштатных[175]. З службовай карэспандэнцыі можна зрабіць выснову, што некаторыя супрацоўнікі консульства кепска ведалі беларускую мову. У сувязі з гэтым 13 сакавіка 1920 г. кіраўнік ВДМ БНР узяў з падначаленых распіскі, што

---

[171] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 72, л. 334 зв.

[172] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 91, л. 14 зв.

[173] АБНР, т. 1, кн. 1, с. 558.

[174] *Новый флаг,* "Сегодня" 1919, № 12 ад 27 верасня.

[175] У студзені 1920 г. у консульстве працавалі: Б. Шымковіч (консул) з 11 жніўня 1919 г., Р. Казячы (сакратар) з 3 лістапада 1919 г., Антон Сцяпура (справавод) з 12 снежня 1919 г., Дзмітры Кабякоў (кур'ер) і М. Каспар (кур'ер) з 8 кастрычніка 1919 г. Акрамя таго, консульства карысталася паслугамі пазаштатных супрацоўнікаў: Уладзіміра Найдзёнава (машыніста), Язэпа Спідына (пісара), Якуба Данілюка (пісара) і Міхася Ляховіча (прыкамандзіраванага да К. Дуж-Душэўскага), якія атрымлівалі 5–15 рублёў у дзень. Консул Б. Шымковіч бачыў патрэбу прыняць на працу юрыста, сакратарку з веданнем замежных моў, а таксама пісараў. Консул скардзіўся таксама на малы заробак, у сувязі са зменай курсу валюты, і прасіў начальства ўрэгуляваць гэта пытанне. НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 62, л. 22–22 зв.; LCVA, f. 582, ap. 2, b. 32, l. 104.

яны вывучаць родную мову і будуць ёй карыстацца[176]. 30 красавіка 1920 г. Р. Казячы адрапартаваў, што ўсе супрацоўнікі консульства размаўляюць па-беларуску[177].

Акрамя консульства ў Рызе, у лістападзе 1919 г. намаганнямі К. Езавітава быў адчынены рэгістрацыйна-пашпартны аддзел у Ліепаі (кіраўнік – студэнт Пётр Цвяткоў)[178]. Сядзіба аддзелу знаходзілася па адрасе: вул. Ружавая 31[179]. Аднак да вясны 1920 г. аддзел не быў зацверджаны ўладамі БНР, што ўскладняла яго працу. Кіраўнік ВДМ звяртаў на гэта ўвагу (28 траўня 1920 г.) міністра замежных спраў БНР[180]. Кіраўнік аддзела ў Ліепаі быў падначалены непасрэдна кіраўніку Вайскова-дыпламатычнай місіі, якому дасылаў справадачы і рапарты пра сваю дзейнасць. У часе адсутнасці шэфа ВДМ кіраўнік аддзела меў права прымаць прадстаўнікоў беларускага ўрада[181]. У красавіку 1920 г. К. Езавітаў прапанаваў кіраўнікам рэгістрацыйна-пашпартных аддзелаў у Ліепаі і Таліне замовіць уласную гербавую пячатку і карыстацца ёй, калі пячатка ВДМ БНР будзе недаступная з тэхнічных прычынаў[182].

Асноўным заняткам консульства і рэгістрацыйна-пашпартнага аддзела была рэгістрацыя на тэрыторыі Латвіі асоб, якія жадалі атрымаць грамадзянства БНР, і выдача ім пашпартоў ці даведак, а таксама працяг тэрміну сапраўднасці дакументаў. Крытэрыем для атрымання беларускага грамадзянства было вызначана месца нараджэння ў дэкларацыяваных межах БНР. Згодна з законам аб беларускім грамадзянстве (14 снежня 1919 г.), яго аўтаматычна атрымліваў кожны, хто да 1914 г. жыў у Беларусі і меў расійскае падданства. Супрацоўнікі консульскай службы пры наданні грамадзянства кіраваліся толькі вуснай заявай кандыдатаў[183]. Асобы, якія жадалі атрымаць пашпарт БНР, мусілі напісаць адпаведную заяву, да якой далучаўся здымак (але ў шмат якіх выпадках патрабаванне не выконвалася). З мэтай пацвярджэння ўласнай ідэнтычнасці людзі далучалі розныя дакументы – нямецкія акупацыйныя пашпарты, расійскія пашпартныя кніжкі, пасведчанні латвійскіх і літоўскіх уладаў, выпіскі з метрык, даведкі расійскіх і нават савецкіх органаў улады з месца жыхарства і месцаў часовага знаходжання на тэрыторыі, якую ўлады БНР лічылі сваёй. Аднак у большасці выпадкаў гэта былі арыгіналы нямецкіх акупацыйных пашпартоў і латвійскіх асабістых дакументаў

---

[176] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 62, л. 45.

[177] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 62, л. 59–59 зв.

[178] АБНР, т. 1, кн. 1, с. 561.

[179] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 72, л. 334 зв.

[180] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 59, л. 21.

[181] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 48, л. 5.

[182] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 72, л. 167.

[183] E. Jekabsons, *Stosunki między Łotwą i Białoruską Republiką Ludową w latach 1919–1921...*, s. 50, 53.

(*Personas apliecība*)[184]. Аналіз разгляду заяў на грамадзянства дазваляе меркаваць, што ступень верыфікацыі звестак, пададзеных заяўнікамі, была невысокая. На практыцы заяўнік сам упісваў звесткі пра сябе, на падставе якіх яму давалі пашпарт. Дакументы часта перасылаліся поштай праз мясцовыя латышскія паліцэйскія органы. Чалавек не мусіў нават асабіста наведваць консульства. Асобы, якія жылі ў Беларусі, але былі прыпісаныя ў іншых частках імперыі, маглі атрымаць грамадзянства БНР, звярнуўшыся з пісьмовай просьбай[185]. Варта дадаць, што ўлады БНР не прызнавалі падвойнага грамадзянства і лічылі гэта дзяржаўнай здрадай[186].

На адсутнасць ахвотных атрымаць грамадзянства БНР не даводзілася наракаць. Спачатку ў консульства звярталіся пераважна беларусы, якіх у Латвіі было няшмат. Да 1 кастрычніка 1919 г. быў выдадзены толькі 151 пашпарт. Аднак за перыяд з 17 жніўня па 31 снежня 1919 г. консульства БНР выдала ажно 1798 пашпартоў[187]. У чэрвені 1920 г. было выдадзена 450 пашпартоў, 3288 пасведчанняў аб наяўнасці беларускага грамадзянства і 4 візы на выезд у Беларусь, а таксама было задаволена 378 просьбаў працягнуць дзейнасць пашпартоў. Разам ад жніўня 1919 г. да канца чэрвеня 1920 г. на консульскі ўлік было пастаўлена 3894 чал.[188] Тым часам, рэгістрацыйна-пашпартны аддзел у Ліепаі ў перыяд з 3 студзеня па 4 жніўня 1920 г. выдаў 254 пашпарты[189]. У верасні 1920 г. консульства ў Рызе зарэгістравала яшчэ 106 чал., з якіх пашпарты атрымалі 4, а пасведчанні аб наяўнасці грамадзянства – 102. У гэты ж час было выдадзена 8 пасведчанняў пра выхад з беларускага грамадзянства, 70 адтэрміновак ад войска і 8 віз на выезд за мяжу[190]. На працягу кастрычніка 1920 г. консульства зарэгістравала 75 чал., выдала 12 пашпартоў, 63 пасведчанні, 16 пасведчанняў пра скасаванне беларускага грамадзянства, 11 віз, 82 адтэрміноўкі, 186 іншых дакументаў[191]. На падставе аналізу дакументацыі консульства можна меркаваць,

---

[184] Звесткі атрыманыя на падставе аналізу заяў на атрыманне нацыянальных і замежных пашпартоў у консульстве БНР у Рызе ў перыяд са жніўня па лістапад 1919 г. Гл.: НАРБ, ф. 864, воп. 1, спр. 11.

[185] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 48, л. 16.

[186] На гэтай падставе ў траўні 1920 г. беларускага грамадзянства быў пазбаўлены Антон Борык, які меў адначасова два пашпарты – беларускі і расійскі. Праўда, сапраўдныя матывы пазбаўлення А. Борыка падданства БНР былі палітычныя, бо яго дзейнасць была прызнаная шкоднай для беларускіх інтарэсаў. НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 48, л. 10–10 зв., 13.

[187] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 62, л. 110.

[188] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 62, л. 117.

[189] Падлік зроблены паводле журнала выдачы пашпартоў аддзелам у Ліепаі. Гл.: НАРБ, ф. 864, воп. 1, спр. 81.

[190] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 59, л. 230.

[191] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 59, л. 257.

што на працягу 1919–1921 гг. пашпарты атрымала болей як 3,5 тыс. чал.[192] Варта памятаць, што акрамя пашпартоў консульская служба выдавала пасведчанні аб грамадзянстве.

Акрамя ўраджэнцаў і жыхароў беларускіх губерняў, па беларускае грамадзянства звярталіся людзі, якія паходзілі з Невеля, Смаленскай губерніі, Даўгаўпілса, Бельска Падляскага і г.д. Пераважную большасць заяўнікаў складалі габрэі. Але падчас запаўнення пашпартных бланкаў, у радку "нацыянальнасць" амаль ва ўсіх выпадках пісалася "беларус". У адзінкавых выпадках трапляецца запіс "габрэй (беларус)"[193]. Відавочна, што нацыянальнасць вызначалася па месцы нараджэння. Габрэяў сярод наведнікаў консульства было столькі, што 20 сакавіка 1920 г. Рада беларускай калоніі ў Рызе разгледзіла просьбу групы грамадзян стварыць у консульстве БНР пасаду 2-га сакратара, якую павінна была заняць асоба габрэйскай нацыянальнасці. Сваю просьбу яны тлумачылі тым, што габрэі, нярэдка, не ведаючы ані беларускай, ані рускай мовы, маюць цяжкасці з афармленнем дакументаў. Рада беларускай калоніі ў Латвіі падтрымала ініцыятыву і звярнулася да консульства з адпаведнай прапановай[194]. Аднак К. Езавітаў лічыў, што ўладкаванне габрэя на пасаду 2-га сакратара консульства магчымае толькі калі Рада беларускай калоніі ў Рызе возьме на сябе ўтрыманне гэтай пасады альбо консульства ўвогуле[195]. З рапартаў кіраўніка ВДМ вынікае, што кандыдаты на вышэйзгаданую пасаду не ведалі беларускай мовы. Прэм'ер В. Ластоўскі таксама не спяшаўся зацвярджаць пасаду сакратара-габрэя і казаў, што пры ўладкаванні на працу ў дзяржаўныя ўстановы нельга кіравацца прынцыпам веравызнання, бо, згодна з законам усе грамадзяне маюць аднолькавыя правы[196]. Такім чынам, справа прызначэння сакратара-габрэя ў консульства БНР не была вырашана.

Матывы, якімі кіраваліся людзі, намагаючыся атрымаць беларускае грамадзянства, былі розныя. Адной з галоўных было жаданне пазбегнуць прызыву ў латвійскае войска. З пачаткам мабілізацыі ў кастрычніку 1919 г. колькасць ахвотных атрымаць беларускае грамадзянства значна павялічылася. Грамадзяне Латвіі былі вайсковаабавязаныя, а асоб без грамадзянства прызыў не тычыўся У лістападзе 1919 г. латвійскі ўрад выдаў закон, згодна з якім неграмадзяне мусілі вызначыцца са сваім падданствам, бо ў адваротным

---

[192] У алфавітнай кнізе рэгістрацыі пашпартоў выдадзеных у 1919 – 1921 гг. налічваецца 3542 пазіцый. Падлік на падставе: НАРБ, ф. 864, воп. 1, спр. 3.

[193] Выснова зроблена на падставе аналізу заяў на атрыманне пашпартоў БНР за перыяд са жніўня па лістапад 1919 г. Гл.: НАРБ, ф. 864, воп. 1, спр. 11.

[194] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 62, л. 52–52 зв.

[195] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 59, л. 11.

[196] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 46, л. 61.

выпадку ім пагражала дэпартацыя. Гэта падштурхнула тых, хто не меў грамадзянства, шукаць магчымасці атрымаць замежнае падданства, што вызваляла б ад службы ў латвійскім войску. Паводле консула Б. Шымковіча, штодзённа консульства выдавала каля 100 пасведчанняў пра грамадзянства БНР[197]. Здараліся выпадкі, калі людзі атрымлівалі беларускае грамадзянства ўжо пасля таго, як іх забіралі ў войска. Часта беларускі бок хадайнічаў перад латвійскімі ўладамі пра звальненне беларускіх грамадзянаў з вайсковай службы[198]. У перыяд з 26 лістапада 1919 па 7 студзеня 1920 г. у Вайскова-дыпламатычную місію БНР былі пададзеныя 393 заявы пра звальненне з латвійскага войска[199].

Асноўную колькасць ухілістаў складалі асобы габрэйскай нацыянальнасці. Латвійская ўлада хутка зразумела іх матывы, таму часамі ігнаравала факт атрымання грамадзянства, лічачы яго фікцыяй. 20 кастрычніка 1919 г. Р. Шаўкоў інфармаваў кіраўніка ВДМ пра першыя арышты латвійскай паліцыяй уладальнікаў пашпартоў БНР[200]. 7 снежня 1919 г. галоўнакамандуючы латвійскага войска афіцыйна загадаў спыніць ліставанне з прадстаўніцтвамі БНР пра вызваленне беларускіх грамадзян ад вайсковай службы. Кіраўнік ВДМ разглядаў гэты крок як парушэнне міжнародных норм, таму 7 студзеня 1920 г. абскардзіў вышэйзгаданы загад у лісце да міністра замежных спраў Латвіі[201]. Нейкі час у дачыненні да ўхілістаў не было зафіксавана ніякіх дзеянняў з боку латвійскіх улад[202]. Аднак з 28 па 31 траўня 1920 г. рыжская паліцыя правяла пагалоўную праверку і затрыманні асоб з беларускім грамадзянствам. У затрыманых сканфіскавалі беларускія пашпарты, а замест іх уручылі пазовы ў ваенкаматы. Затрыманні адбываліся ў грамадскіх месцах – на вуліцах, у кавярнях і рэстаранах, у тэатры. Вось як здарэнне апісаў К. Езавітаў у рапарце старшыні Рады народных міністраў БНР: "*Асабліва нетактычна і варожа была праведзена 'праверка' дакументаў у тэатры 'Палас', дзе было каля 200 чалавек публікі і дзе паліцыя падыходзіла толькі да яўрэяў і пыталася 'Беларус'. Калі адказвалі Беларус – зараз-жа адбіралі дакумент і прыказвалі явіцца на другі дзень да ўгалоўнай паліцыі, угражая прывесці, у выпадку няяўкі, аружнай сілай. Частка явіўшыхся затрымлівалася. Многія арыштоўваліся адразу*"[203].

Паводле К. Езавітава, затрыманні суправаджаліся маральным здзекам і вымаганнем грошай. Падзеі выклікалі хваляванні ў беларускай калоніі

---

[197] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 62, л. 20.

[198] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 69.

[199] Ю. Юркевіч, *Стварэнне і дзейнасць Асобнага атрада БНР у Балтыі*..., с. 137–138.

[200] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 71, л. 2 зв.

[201] LVVA, 2574 f., 2 ap., 3 l., 16 l.

[202] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 46, л. 54 зв.; Тамсама, спр. 59, л. 48; LCVA, f. 582, ap. 2, b. 32, l. 8.

[203] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 59, л. 48 зв.

Латвіі. Ахвяры "паліцэйскай аблавы" пачалі масава звяртацца ў консульства БНР па дапамогу ў высвятленні справы. 1 чэрвеня 1920 г. консул БНР прасіў кіраўніка ВДМ запатрабаваць тлумачэнні ў МЗС Латвіі[204]. Кіраўнік Вайскова-дыпламатычнай місіі звярнуўся да міністраў замежных і ўнутраных спраў Латвіі. 4 чэрвеня адбылася аўдыенцыя К. Езавітава ў прадстаўніка МУС Петэрыса Бергіса (*Pēteris Berģis*), падчас якой апошні запэўніў, што беларускія грамадзяне будуць вызваленыя, а пашпарты ім вернутыя. Далейшая праверка павінна была ісці канцылярскім спосабам ва ўзгадненні паміж МУС Латвіі і консульствам БНР. Пра дасягнутае паразуменне К. Езавітаў паінфармаваў мясцовую прэсу, каб супакоіць настроі ў тутэйшай беларускай грамадзе[205]. Беларускія дзеячы ўсведамлялі, што большасць асоб, якія атрымалі пашпарты БНР, кіруюцца не патрыятычнымі, а практычнымі інтарэсамі. У рапарце (8 чэрвеня 1920 г.) прэм'еру БНР К. Езавітаў паведамляў, што стаўленне латышоў да габрэяў ніколі не было добрым, але яно яшчэ пагоршылася, калі апошнія пачалі браць замежнае грамадзянства, каб ухіляцца ад службы ў войску. Кіраўнік ВДМ адзначаў, што мясцовая прэса адмоўна ставіцца да дзейнасці літоўскага, украінскага і беларускага дыпламатычных прадстаўніцтваў, якія даюць габрэям свае пашпарты[206]. Тым не менш, беларускі бок працягваў выдаваць пашпарты і пасведчанні ўсім ахвотным, бо гэта было значнай крыніцай прыбытку (гаворка пра гэта будзе пазней).

Акрамя жадання ўхіліцца ад службы, былі і іншыя прычыны, якія прымушалі людзей карыстацца паслугамі консульскай службы БНР. Адным з матываў была пагроза дэпартацыі неграмадзян з Латвіі, ад якой ратавала атрыманне беларускага падданства[207]. Наогул, у тагачасных міжнародных рэаліях атрыманне грамадзянства краіны нават з нявызначаным статусам здавалася лепшым выйсцем, чым адсутнасць якога-колечы падданства. Нацыянальны пашпарт дазваляў легальна знаходзіцца на тэрыторыі Латвіі. Атрымаўшы дакумент, яго ўласнік мог аформіць латвійскую візу, якая дазваляла легальна знаходзіцца ў краіне. З прычыны таго, што каля 80% асоб, зарэгістраваных у консульстве БНР, былі незаможнымі людзьмі, звычайна яны не мелі грошай, каб заплаціць за латвійскую візу (46 руб.). Нярэдка здараліся сітуацыі, калі людзі звярталіся ў беларускае консульства з просьбай кампенсаваць выдаткі на візы за кошт Дзяржаўнага скарбу БНР. Не маючы сродкаў, консульства хадайнічала – найчасцей беспаспяхова – перад латвійскімі ўладамі пра вызваленне незаможных беларускіх грамадзян ад візавых аплат[208].

---

[204] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 59, л. 10.

[205] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 59, л. 84–84 зв.

[206] LCVA, f. 582, ap. 2, b. 32, l. 13–14, 16–18.

[207] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 80, л. 4–5, 10, 15.

[208] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 59, л. 24–24 зв.

Замежны пашпарт БНР быў патрэбны тым, хто планаваў эміграваць з Латвіі. Некаторыя габрэі звярталіся ў беларускае консульства і прасілі выдаць ім пашпарты БНР для эміграцыі ў Палестыну[209]. У якасці прычыны выезду за мяжу нярэдка пазначалася "таргоўля" альбо "ўчэнне". Акрамя таго, многія пісалі "праца" або ўвогуле пакідалі гэту рубрыку пустой[210]. Заслугоўвае ўвагі выпадак ураджэнкі Бельска Падляскага Паўлі Младзяноўскай, якая служыла эканомкай на параходзе Ліепая – Лондан. Пашпарт быў ёй трэба, каб узімку застацца ў Лондане[211]. На просьбу грамадзян консульская служба БНР дапамагала ім у афармленні віз. З гэтай мэтай супрацоўнікі консульства кантактаваліся з прадстаўніцтвамі замежных дзяржаў. З ліставання паміж кіраўніком ВДМ і прэм'ерам БНР вынікала, што ўлетку 1920 г. літоўскі консул у Ліепаі адмовіўся выдаваць візы грамадзянам БНР. Кастусь Езавітаў лічыў, што з мэтай прадухілення падобных непаразуменняў неабходна скіраваць у Коўна Пятра Крачэўскага або іншага палітыка БНР, каб скончыць літоўска-беларускія перамовы[212].

Гісторыя зафіксавала выпадкі, калі консульскія паслугі ператвараліся ў крыніцу непаразуменняў паміж беларускімі дзеячамі. 4 лістапада 1920 г. кіраўнік ВДМ паінфармаваў старшыню Рады міністраў БНР пра інцыдэнт у сядзібе консульства 4 лістапада з удзелам яго самога, У. Пігулеўскага і сакратара Рады БНР Язэпа Мамонькі, які наведаў Рыгу. Апошні, паводле слоў К. Езавітава, запатрабаваў ад яго і У. Пігулеўскага пашпартны бланк на імя іншай асобы. Атрымаўшы адмову, ён абрынуўся на кіраўніка ВДМ "*з брудной лаянкай і плашчаднай бранню*". Апошні палічыў гэта абразай і звярнуўся да ўлад БНР з патрабаваннем "паставіць на месца" Мамоньку[213]. На думку К. Езавітава Я. Мамонька "*дапусціўся грубых дэмагагічных і зусім не адпаведных яго пасадзе лаянак у дачыненні да консула Рыгі Пігулеўскага. Закіды Мамонькі, што нібыта місія выдала дыпламатычныя пашпарты спекулянтам, ёсць грубай дэмагогіяй і маной. За ўвесь час місія выдала толькі 8 такіх пашпартоў*"[214].

Уладальнікі беларускіх пашпартоў мелі ўсе падставы карыстацца дапамогай консульскай службы БНР на выпадак надзвычайных сітуацый. Напрыклад,

---

[209] 11 жніўня 1920 г. у консульства з заявай аб атрыманні пашпарта БНР звярнуўся ўраджэнец Барысаўскага павету Мойша Залкінд. Заяўца адзначаў, што з дапамогай дакумента ён жадае эміграваць у Палестыну. НАРБ, ф. 864, воп. 1, спр. 10, л. 75; НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 69, л. 230.

[210] Высновы зроблены на падставе аналізу заяў на атрыманне нацыянальных і замежных пашпартоў у консульстве ў Рызе за перыяд з 10 сакавіка па 4 жніўня 1920 г. НАРБ, ф. 864, воп. 1, спр. 84.

[211] НАРБ, ф. 864, воп. 1, спр. 84, л. 76.

[212] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 46, л. 77.

[213] ГАРФ, ф. 5875, оп. 1, д. 11, л. 469–469 зв.

[214] ГАРФ, ф. 5875, оп. 1, д. 11, л. 442–442 зв.

у консульства звярнуўся грамадзянін БНР, жыхар Рыгі Сымон Танкель, які 1 чэрвеня 1920 г. стаў ахвярай нападу латвійскіх жаўнераў. Тыя пабілі і абрабавалі яго, забраўшы пашпарт і 3 тыс. латвійскіх рублёў. Заяўнік скардзіўся консулу на здзекі і гвалт з боку латвійскіх улад і прасіў паспрыяць у вяртанні забраных рэчаў і выдаць часовае пасведчанне пра грамадзянства[215]. Былі выпадкі, калі людзі звярталіся ў консульства БНР са скаргамі на латвійскія ўлады, якія рэквізавалі ў іх свойскую жывёлу і іншую маёмасць. У большасці выпадкаў намаганні консульства не давалі эфекту. У якасці прыкладу можна прывесці гісторыю Юды Цемахава, які з дапамогай консульства хацеў атрымаць кампенсацыю за двух коней. Аднак Міністэрства сацыяльнага забеспячэння Латвіі паінфармавала беларускага консула, што кампенсацыі даць не можа, бо коней забралі невядомыя людзі, асобы якіх высветліць не ўдалося[216].

За пасярэдніцтвам консульства беларускія грамадзяне ў Латвіі, маглі слаць лісты ў занятую польскімі войскамі Беларусь, а таксама (праз Надзвычайную дыпламатычную місію БНР у Берліне) сваякам – ваеннапалонным рускай арміі ў Нямеччыне[217]. У чэрвені 1920 г. консул БНР хадайнічаў перад Аддзелам сацыяльнага забеспячэння Латвіі, каб беларускім грамадзянам выдалі супныя і хлебныя талоны[218]. Па дамоўленасці з латвійскімі ўладамі да 15 траўня 1920 г. грамадзян БНР прымалі ў дзяржаўныя шпіталі Латвіі на роўных правах з латвійцамі, але пазней за медычную дапамогу беларусам даводзілася плаціць[219].

Істотным напрамкам дзейнасці консульства была дапамога беларусам, якія ў выніку ваеннай завірухі апынуліся на чужыне (у краінах Балтыі, Польшчы, Нямеччыне), але хацелі вярнуцца на Бацькаўшчыну. У лістападзе 1919 г. К. Дуж-Душэўскі звярнуўся ў МЗС Эстоніі з просьбай дапамагчы ў гэтай справе беларусам з Віцебшчыны і Смаленшчыны, якія на савецка-эстонскім фронце дэзерціравалі з Чырвонай арміі і перайшлі на бок эстонцаў[220]. Консульская служба БНР падтрымлівала сувязі з Надзвычайнай дыпламатычнай місіяй БНР у Берліне і з камісіяй па вызваленні ваеннапалонных і ўцекачоў пры МУС Латвіі. Першая скіроўвала ў консульства ў Рызе дакументацыю ваеннапалонных з мэтай падрыхтоўкі іх праезду праз Латвію, а другая – рабіла запыты ў беларускае консульства, разглядаючы справы вяртання праз Латвію ў Беларусь з палону, бежанцаў і асоб, якія нарадзіліся

---

[215] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 62, л. 91.
[216] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 73, л. 19.
[217] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 143, л. 4.
[218] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 62, л. 116.
[219] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 59, л. 24–24 зв.
[220] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 57, л. 9.

ў Беларусі[221]. Замест пашпартоў вяртанцы атрымлівалі пасведчанні аб грамадзянстве альбо пасведчанні бежанцаў. Напрыклад, восенню 1919 г. консульства займалася справай 27 беларусаў – ваеннапалонных рускай арміі, якія вярталіся з Нямеччыны праз Рыгу ў Беларусь[222]. Вось што пісала газета "Сегодня": "*Учора ў мясцовае беларускае консульства з'явілася вялікая колькасць ваеннапалонных з просьбай аб выдачы адпаведных дакументаў для праезду на радзіму. Палонныя беларусы прыехалі ў латышскім эшалоне. Большасць з іх падчас знаходжання ў палоне працавала ў сельскай гаспадарцы. Цяпер жа, з дэмабілізацыяй і вяртаннем у Нямеччыну з палону жаўнераў, ваеннапалонным былой рускай арміі становіцца шторазу цяжэй і цяжэй*"[223].

У красавіку 1920 г. у беларускае консульства звярнуліся тры беларусы, былыя афіцэры арміі М. Юдзеніча, якія перайшлі мяжу з Эстоніі і таксама жадалі вярнуцца дахаты[224]. У ліпені 1920 г. у ВДМ звярнуліся некалькі беларусаў з Віленшчыны, якія дэзерціравалі з Чырвонай арміі. Яны ўцяклі ў Латвію, адкуль намагаліся вярнуцца на Бацькаўшчыну[225]. Цікавы выпадак Мендэля Когана, які падчас I сусветнай вайны знаходзіўся ў Расіі, пра што сведчаць пячаткі расійскіх і савецкіх органаў улады аб прыпісцы ў расійскім пашпарце, якія паходзілі з розных гарадоў, у тым ліку – з Масквы. Пасля вайны з невядомых прычын ён трапіў у Рыгу, дзе звярнуўся ў консульства БНР на той падставе, што нарадзіўся ў Чашніках, куды і збіраўся вярнуцца, атрымаўшы падданства БНР[226].

Ад сярэдзіны 1920 г. назіраўся адваротны працэс: у консульства звярталіся асобы з просьбамі пра выхад з беларускага грамадзянства. Аналіз архіўных крыніц дазваляе меркаваць, што ад грамадзянства БНР адмовілася каля 10% тых, хто раней яго атрымаў. Адной з асноўных прычын было жаданне атрымаць падданства іншай дзяржавы або замежную візу. Напрыклад, некаторыя пісалі ў заявах аб выхадзе з грамадзянства БНР, што не могуць атрымаць амерыканскую візу па беларускім пашпарце. Іншыя жадалі прыняць латвійскае грамадзянства, што было немагчыма без выхаду з беларускага. Некаторыя абгрунтоўвалі рашэнне тым, што, не маючы латвійскага грамадзянства, яны "очень ограничены в правах". Консульства не пярэчыла і выдавала даведкі пра выхад з грамадзянства. Паводле рашэння кіраўніка ВДМ або консула, за гэтую паслугу маглі брацца грошы. Тычылася

---

[221] НАРБ, ф. 864, воп. 1, спр. 9, л. 8, 23, 33.

[222] НАРБ, ф. 864, воп. 1, спр. 9, л. 2.

[223] *Белоруссия. Военнопленные белорусы в Риге*, "Сегодня", 1919, № 14 ад 30 верасня.

[224] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 62, л. 65.

[225] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 106, д. 215.

[226] НАРБ, ф. 864., воп. 1, спр. 11, л. 70.

гэта заможных заяўнікаў накшталт Берка Старобінца. Кіраўнік ВДМ, разглядаючы яго справу, адзначыў, што заяўнік пакідае беларускае грамадзянства, каб весці камерцыйныя справы ў Латвіі і прапанаваў абкласці яго "*аднаразовым налогам на карысць Дзяржаўнага фонду па адбудове разбуранай і зруйнаванай вайной беларускай сялянскай гаспадаркі ў ліку 5000 латвійскіх рублёў*"[227]. Большасць выпадкаў выхаду з беларускага грамадзянства здарылася ў другой палове 1920 г. Можна меркаваць, што ў значнай ступені гэта была рэакцыя людзей на ваенна-палітычныя падзеі ў рэгіёне. Рабілася відавочным, што БНР мае марныя перспектывы. У сувязі з гэтым належала звязваць лёс з іншай дзяржавай, якая была ў стане забяспечыць грамадзянам нейкую будучыню і побыт.

Дзеячы БНР у Латвіі спрабавалі пашырыць дыпламатычна-консульскую дзейнасць на тыя тэрыторыі краіны, дзе кампактна пражывала беларускамоўнае насельніцтва. 22 студзеня 1920 г. К. Езавітаў звярнуўся да міністра замежных спраў Латвіі па дазвол адчыніць рэгістрацыйна-пашпартныя аддзелы БНР у Даўгаўпілсе і Рэжыкнэ. У адказ кіраўнік латвійскага МЗС паінфармаваў, што гэта будзе магчыма толькі пасля стварэння ў Латгаліі латвійскай дзяржаўнай адміністрацыі. 11 сакавіка 1920 г. кіраўнік ВДМ яшчэ раз скіраваў просьбу матывуючы гэта чуткамі, што ў Латгаліі ўжо створаныя органы латвійскай улады[228]. Не чакаючы адказу латвійскага боку, у красавіку 1920 г. К. Езавітаў прызначыў дзвінчука Пятра Паўчэра ўпаўнаважаным на Даўгаўпілс і Латгалію. Апошні атрымаў паўнамоцтвы арганізаваць у рэгіёне беларускую нацыянальную раду і культурна-асветнае таварыства, а таксама пашыраць беларускую літаратуру[229]. Крокі кіраўніка ВДМ не выклікалі энтузіязму ва ўладаў у Рызе, якія сваю нязгоду з дзейнасцю органаў БНР у Латгаліі тлумачылі няпэўным статусам беларускай дзяржавы. Кіраўнік ВДМ з жалем канстатаваў, што супраціў латвійскіх улад быў галоўнай прычынай няўдачы яго місіі скіраванай на пашырэнне дзейнасці БНР у Латгаліі: "*Спробы ВДМ БНР пайсці на спатканне і падмогу беларускаму жыхарству у Латгаліі і вызваць у іх мясцовую ініцыятыву канчаюцца вельмі няўдачна: 1. На двукратную прапазіцыю – просьбу Місіі ад дазваленні ў Дзвінску ці Рэжыцы, на прыклад Лібавы і Рэвеля, Аддзел Місіі, – Латвійскае Міністэрства Міжнародовых Спраў, двойчы адмаўляе, грунтуючыся нібыта на няпэўным вайсковым становішчы Латгаліі. 2. Супрацоўнік Місіі, грамадзянін Багданаў, пасланы ў Люцын, каб стварыць там таварыства 'Бацькаўшчыну' і Беларускі Камітэт з беларусоў-грамадзян Латвіі, быў арыштаваны і высланы мясцовай Латвійскай уладай; 3. Супрацоўнікі-карэспандэнты, пасля гэтага*

[227] НАРБ, ф. 864, воп. 1, спр. 10, л. 1.

[228] LVVA, 2574 f., 2 ap., 3 l., 47 lp.

[229] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 72, л. 181.

здарэння, не пісалі і не адказвалі на лісты некалькі месяцаў; 4. Супрацоўнікі Місіі ў Дзвінску, гр. Паўчэр, – спаліў даручаную яму беларускую літаратуру, з вялікім трудом атрыманую перад тым з Вільні"[230].

Не ўяўляецца магчымым верыфікаваць словы беларускага дзеяча, але бясспрэчным фактам з'яўляецца тое, што ўлады ў Рызе адмоўна ставіліся да пашырэння дзейнасці структур БНР на Латгалію. 14 красавіка 1920 г. міністр унутраных спраў Латвіі абвясціў, што консульскія аддзелы БНР у Латгаліі будуць адчынены толькі пасля заканчэння рэгістрацыі жыхароў рэгіёну, якую правядуць латвійскія дзяржаўныя органы. Латвійскі даследчык Эрыкс Екабсонс лічыць, што пазіцыя латышоў была вынікам непаразуменняў у сувязі з вызваленнем грамадзян БНР ад службы ў латвійскім войску[231]. Здаецца, аднак, што за пазіцыяй латышскіх улад хаваўся перадусім страх, што беларускія дзеячы маглі выкарыстаць сваю дзейнасць у Латгаліі да абгрунтавання ў будучыні прэтэнзій на рэгіён. Яскрава сведчыць пра гэта факт, што яшчэ ў сакавіку 1920 г. латвійскія ўлады на загад кіраўніка МЗС канфіскавалі наклад часопіса "На чужыне" за публікацыю мапы Беларусі, у межах якой былі пазначаныя Даўгаўпілскі ды Ілукштанскі паветы[232]. 31 траўня 1920 г. Езавітаў падрыхтаваў прэм'еру БНР статыстычныя звесткі пра колькасць беларусаў у Лудзе і Лудзенскім павеце. На думку кіраўніка ВДМ, у шэрагу валасцей беларусы складалі 80–90% насельніцтва[233]. 7 ліпеня 1920 г. прэм'ер В. Ластоўскі прапанаваў К. Езавітаву вызначыць колькасць беларусаў у Латвіі, а таксама звярнуцца да ўлад Латвійскай Рэспублікі з прапановай даць латгальскім беларусам нацыянальна-культурную аўтаномію[234]. Аднак ваенная і міжнародная сітуацыя, а таксама кволая пазіцыя ўлад БНР, не дазволілі ажыццявіць гэтыя планы.

Нягледзячы на тое, што дзеячам БНР не ўдалося стварыць у Латгаліі свае дыпламатычныя прадстаўніцтвы, некаторыя жыхары рэгіёну ведалі пра дзейнасць беларускай дыпламатычнай і консульскай службы ў Латвіі. Сярод грамадзян, якія ў 1919–1920 гг. звярталіся ў консульства БНР у Рызе па нацыянальныя пашпарты, былі жыхары Латгаліі[235]. У адным з пазнейшых лістоў ураду БНР К. Езавітаў пісаў: "*Толькі з сярэдзіны 1920 года, аглядаючыся з апаскай на палякаў і бальшавікоў і не ведаючы яшчэ адносін да сябе Латвійскага Ураду, трымаўшага і да гэтага часу трымаючага па ўсёй Латгаліі Вайсковае становішча (Военное положеніе), начынаюць беларусы*

---

[230] БДАМЛіМ, Ф. 3, воп. 1, спр. 56, л. 164–165.

[231] E. Jekabsons, *Stosunki między Łotwą i Białoruską Republiką Ludową w latach 1919–1921*, s. 57.

[232] Ю. Юркевіч, *Стварэнне і дзейнасць Асобнага атрада БНР у Балтыі*..., с. 111.

[233] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 59, л. 20.

[234] НАРБ. ф. 325, воп. 1, спр. 59, л. 112–112 зв.

[235] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 69, л. 161, 177, 191.

праяўляць першыя знакі свайго жыцця: з'яўляюцца 'пагутарыць' і 'паінфармаваць' у Місію асобныя адзінкі і асабістыя знаёмыя Шэфа Місіі, цікавяцца беларускай і расейскай кніжкай пра Беларусь, шукаюць вестак пра беларускія справы ў газетах. З'арганізаваць іх, аднак, у які-небудзь нацыянальны гурток не ўдаецца, бо, з аднаго боку, жыхарства тэрарызуецца бальшавікамі і ўвесь час чакае і баіцца іх павароту (асабліва пасля вайсковых афензіў на Варшаву), з другога-ж боку не драмаюць і палякі, распускаючы весткі аб аддачы Латвіяй Латгаліі палякам, каб загарадзіцца ад Расеі, агітуючы процiў Латвіі і Латвійскай аграрнай рэформы, адчыняючы польскія школы, арганізуючы вялікія касцельныя і крыжавыя ходы з польскімі гербамі і харугвамі. Запуганае беларускае жыхарства не адважваецца падняцца і прыступіць да працы на сваёй культурна-нацыянальнай аўтаноміі, права на якую і належныя рэальныя абставіны мае згодна Латвійскім законам"[236].

Звярталіся ў ВДМ і мясцовыя жыхары Латгаліі, а ўраджэнцы Беларусі, якіх лёс закінуў на Даўгаўпілшчыну. З 17 жніўня па 31 кастрычніка 1919 г. беларускае грамадзянства атрымалі не менш як 57 габрэяў з Даўгаўпілса і Даўгаўпілскага павета[237]. У пазнейшы час здараліся падобныя выпадкі. У верасні 1920 г. у консульства ў Рызе звярнулася ўраджэнка Горацкага павету Магілёўскай губерні Марыя Карнёва. Сваю просьбу атрымаць беларускі пашпарт жанчына тлумачыла адсутнасцю дакументаў (іх забралі бальшавікі), што ўскладняла ёй кантакты з латвійскімі ўладамі[238]. У лістападзе 1920 г. у беларускае консульства звярнуўся жыхар Істэрскай воласці Лудзенскага павета Ігнат Масальскі, які нарадзіўся ў Дрысе. У звароце да консула ён падкрэсліваў, што ад 1905 г. ён з сям'ёй жыў на Лудзеншчыне. Заяўнік прасіў выдаць пасведчанне, што ўлады БНР не супраць яго пераходу ў латвійскае грамадзянства[239]. Консульства і пазней атрымлівала звароты па беларускае грамадзянства ад жыхароў Латгаліі. У архівах консульства захавалася заява жыхара Даўгаўпілса Якуба Букланава, датаваная лютым 1921 г.[240]

Фінансавая дзейнасць консульства знаходзіліся пад наглядам ВДМ, кіраўнік якой склікаў рэвізійную камісію для верыфікацыі выдаткаў. Разлікі і фінансавыя аперацыі ажыццяўляліся ў 1919 г. у нямецкіх марках, а ў наступныя гады – як у "старых" расійскіх рублях, так і ў латвійскай валюце. На падставе аналізу службовай дакументацыі ВДМ і консульства належыць зрабіць выснову, што дыпламатычная і консульская службы БНР у Латвіі адчувалі пастаянную нястачу грошай. 1 верасня 1919 г. Рада народных міністраў БНР

---

[236] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 56, л. 164–165.

[237] НАРБ, ф. 864, воп. 1, спр. 1.

[238] НАРБ, ф. 864, воп. 1, спр. 11, л. 38.

[239] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 69, л. 211.

[240] НАРБ, ф. 864, воп. 1, спр. 10, л. 114.

зацвердзіла каштарыс Вайскова-дыпламатычнай місіі ў памеры 2 тыс. марак на верасень і па 1 700 марак на наступныя месяцы[241]. Аднак 7 лістапада 1919 г. К. Езавітаў інфармаваў міністра фінансаў БНР пра тое, што ў распараджэнні ВДМ знаходзілася толькі 10 тыс. марак і прасіў пра яшчэ 30 тыс. марак. На думку кіраўніка ВДМ гэтай сумы хапіла б на ўтрыманне консульства ў Рызе цягам усяго 1920 года. Акрамя таго, ён прасіў выдаткаваць дадаткова 400 тыс. марак на ўтрыманне Асобнага атрада войскаў БНР у Балтыі[242]. У адказ 17 лістапада 1919 г. урад БНР зацвердзіў месячны бюджэт місіі ў памеры 18 300 марак[243]. Аднак выдаткі ВДМ за студзень 1920 г. былі значна большыя і складалі: кошты ўтрымання місіі – 19 050 нямецкіх марак, рэгістрацыйна-пашпартных аддзелаў – па 2 500 на кожны, агітацыйнай працы ў Асобным атрадзе войск БНР у Балтыі – 1 500 марак. Дадатковай крыніцай прыбытку місіі і консульства былі консульскія зборы, аплата за рэгістрацыю грамадзянства, выдачу пашпартоў і пасведчанняў. З касавай кнігі консульства вынікае, ад 1 снежня 1919 да 1 студзеня 1920 г. гэта дзейнасць прынесла 46 905 латвійскіх рублёў. Аднак выдаткі таксама былі значныя – 40 739. Такім чынам, чысты прыбытак склаў 6 166 латвійскіх рублёў,[244] што не пакрывала дэфіцыту, які вынікаў са значных выдаткаў на патрэбы беларускіх прадстаўніцтваў.

Кастусь Езавітаў вызначаўся вялікім спрытам і энергіяй у пошуку сродкаў на дзейнасць даручанай яму ўстановы. Ён звярнуўся да ўраду БНР з прапановай падтрымаць выпуск у Рызе пазыкі для беларускіх грамадзян і прыхільных да Беларусі дзяржаў, а таксама крэдытных квіткоў – паштовых марак. З гэтай мэтай ён падрыхтаваў праект грашовых асігнацый БНР. На патрэбы пошты Асобнага атрада БНР пры ўдзеле мастака Рыхарда Зарыньша быў распрацаваны праект "Асобны атрад БНР". 19 студзеня 1920 г. К. Езавітаў звярнуўся да міністра фінансаў Латвіі з просьбай дазволіць друк пяці намінералаў паштовай маркі (5 кап., 10 кап., 50 кап., 1 рубель) накладам 500 000 асобнікаў кожнага наміналу. Рэалізацыя такой колькасці марак магла прынесці прыбытак у 905 000 латвійскіх рублёў. Першая партыя (500 000 штук па 15 кап.) была атрымана ВДМ 14 лютага 1920 г., а на наступны дзень К. Езавітаў прасіў міністра транспарту Латвіі выдаць загад, каб лісты, аплачаныя гэтай маркай, прымала і перасылала латвійская дзяржаўная пошта. Другая партыя была надрукаваная пры канцы лютага 1920 г. Такім чынам, беларускі дзеяч здолеў за кароткі час наладзіць зварот першых беларускіх паштовых марак, якія палявая пошта ў Латвіі выкарыстоўвала да красавіка 1920 г.[245]

---

[241] АБНР, т. 1, кн. 1, с. 419.

[242] АБНР, т. 1, кн. 1, с. 482.

[243] АБНР, т. 1, кн. 1, с. 499.

[244] Ю. Юркевіч, *Стварэнне і дзейнасць Асобнага атрада БНР у Балтыі*..., с. 142.

[245] Ю. Юркевіч, *Стварэнне і дзейнасць Асобнага атрада БНР у Балтыі*..., с. 145.

Нягледзячы на гэтыя захады, грашовае становішча беларускіх прадстаўніцтваў у Латвіі не палепшылася. 1 лютага 1920 г. К. Езавітаў пісаў А. Луцкевічу, што "*каб не добрыя знаёмыя, я павінен быў бы кінуць усю справу і ўцякаць куды вочы глядзяць*"[246]. Кіраўнік ВДМ спрабаваў наладзіць фінансаванне з дапамогай беларускай калоніі, але сабраных сродкаў не хапала нават на неабходную працу. У сувязі з гэтым К. Езавітаў зноў прасіў урад пра грошы, даючы зразумець, што місія ў Балтыі важнейшая за іншыя[247]. Праз безграшоўе кіраўнік ВДМ быў вымушаны абмежаваць да мінімуму службовыя паездкі. У гэты час ён заняўся пісаннем зваротаў да ўрадаў іншых дзяржаў, выслаўшы 22 ноты з просьбай прызнаць БНР, дапамагчы ў змаганні з бальшавікамі, прыняць беларускія місіі[248]. З далейшай карэспандэнцыі з беларускімі дзеячамі вынікае, што праблема адсутнасці грошай не была вырашаная[249].

Фінансаванне, якое Вайскова-дыпламатычная місія атрымлівала ад урада БНР, не было стабільным. 12 сакавіка 1920 г. К. Езавітаў адзначаў, што місія не атрымала належных ёй грошай за снежань, студзень, люты і сакавік. У выніку заробак супрацоўнікам не быў выплачаны за тры месяцы. Кіраўнік ВДМ пісаў: "*Трымаемся тым, што да гэтага часу ўдалося рознымі шляхамі сабраць з грамадзян, а таксама і тым, што прадаемо і адкладаемо свае зімовыя рэчы*"[250]. Адначасова кіраўнік ВДМ адзначаў, што робіць усё магчымае, каб установа далей працавала, але, калі не атрымае ад урада 75 тыс. марак на заробкі для супрацоўнікаў, будзе вымушаны зачыніць місію. Ён падкрэсліваў: "*Дзеля таго, што ў Латвіі мне ўдалося падняць вялікі беларускі нацыянальны рух, які дае магчымасць зрабіць тутака новую базу Беларускай справы, я лічу патрэбным, каб Місія і нашы тутэйшыя ўстановы існавалі тутака далей і былі Вамі ўсімі спосабамі падтрыманы*"[251]. Дапамогі патрабавала таксама консульства. У сакавіку 1920 г. консул у рапарце кіраўніку ВДМ звяртаў увагу, што жыццё ў Рызе падаражэла, таму лічыў патрэбным павысіць заробкі супрацоўнікам. Кіраўнік ВДМ абяцаў выканаць гэтую просьбу, пачынаючы з красавіка[252]. Аднак заявы некаторых супрацоўнікаў консульства (пісара Уладзіміра Найдзёнава) сведчаць, што падвышэнне было нязначнае. Супрацоўнік скардзіўся, што заробак па-ранейшаму быў нездавальняючы ў параўнанні з ростам цэн у Рызе. Ён звяртаў увагу на тое, што працы ў консульстве прыбывае, а грошай – не[253].

---

[246] АБНР, т. 1, кн. 1, с. 643.

[247] АБНР, т. 1, кн. 1, с. 643.

[248] АБНР, т. 1, кн. 1, с. 643.

[249] АБНР, т. 1, кн. 1, с. 675, 676.

[250] Цыт. за: Ю. Юркевіч, *Стварэнне і дзейнасць Асобнага атрада БНР у Балтыі*..., с. 152.

[251] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 72, л. 33.

[252] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 62, л. 45, 52.

[253] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 62, л. 60.

Матэрыяльную сітуацыю ўскладнялі памылкі кіраўніцтва консульскай службы. 27–28 красавіка 1920 г. рэвізійная камісія ў складзе Э. Сангайла-Станевіча, А. Вальковіча і Ю. Гладкага знайшла недакладнасці ў кнізе выдаткаў, што было вынікам нядбайнасці з боку былога консула Б. Шымковіча[254]. 25 траўня 1920 г. новы консул Р. Казячы інфармаваў кіраўніка ВДМ: "*У апошнія часы даходнасць Консульства невялікая і з кожным днём памяншаецца, а таму, у звязку з адыходам сум на старану, Консульства хутка будзе ў не састаянні ўтрымліваць свой штат служачых*"[255]. У гэты час штат консульства налічваў пяць супрацоўнікаў[256].

Каб палепшыць сітуацыю, 15 траўня 1920 г. В. Ластоўскі параіў К. Езавітаву пазычыць грошы ва ўкраінскім консульстве[257]. Скарыстаўшыся парадай прэм'ера, кіраўнік ВДМ пазычыў 25 тыс. рублёў ва Украінскай місіі ў Латвіі. Аднак з пазнейшага ліставання паміж К. Езавітавым і В. Ластоўскім вынікае, што першы не быў у стане вярнуць пазыку, чаго ўсё больш рашуча патрабавалі ўкраінцы. Кіраўнік ВДМ у роспачы прасіў прэм'ера выслаць грошы на пагашэнне пазыкі[258]. Тым часам, безграшоўе паралізавала працу рэгістрацыйна-пашпартнага аддзела ў Ліепаі. 1 чэрвеня 1920 г. К. Езавітаў загадаў звольніць памочніка кіраўніка аддзела Рыгора Злоцкага. Больш за тое, кіраўнік ВДМ дакараў П. Цвяткова, што ён самавольна выплаціў памочніку аванс[259]. 8 ліпеня 1920 г. з фінансавых прычын аддзел у Ліепаі спыніў працу.

Нястачу сродкаў яскрава ілюструе ліст (4 верасня 1920 г.) сакратара ВДМ на імя К. Езавітава, у якім ён наступным чынам тлумачыў затрымкі з візітам да міністра замежных спраў Латвіі: "*Адсутнасць вопраткі ў якой магчыма было б рабіць афіцыйныя візіты, а таксама непрыстойнае становішча той вопраткі, якая ў мяне ёсць, што, на мой погляд, безвярнукова лішае мяне магчымасці як адной з асоб прадстаўляючых Дзяржаўныя інтарэсы Нашай Бацькаўшчыны за межамі, з'яўляецца з афіцыяльнымі візітамі да Міністра Між. Спраў (Пры гэтым дадаю, што паложаныя мне грошы на вопратку я яшчэ не атрымаў)*"[260]. У дадзенай сітуацыі кіраўнік ВДМ быў бездапаможны. Прызнаючы неплацежаздольнасць даручанай яму ўстановы, К. Езавітаў быў вымушаны адмаўляць у дапамозе асобам, якія да яго звярталіся. У адным

---

[254] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 62, л. 71–72.

[255] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 59, л. 24а.

[256] Гэта былі наступныя асобы: Рыгор Казячы (консул), Антон Сцяпура (справавод), Уладзімір Найдзёнаў (пісар), Юры Мышко (пісар) і Дзмітры Кабякоў (кур'ер). НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 59, л. 24а–24а зв.

[257] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 46, л. 44.

[258] Пра гэта сведчыць ліст К. Езавітава В. Ластоўскаму ад 16 лютага 1921 г. НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 69. л. 39.

[259] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 72, л. 245.

[260] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 106, л. 238.

з рапартаў ён адзначаў: "*Цяжкае грашовае становішча мае павелічывацца яшчэ і ад таго, што, усе, хто скуль едуць сюды і апіраючыся на рожныя прадпісання, зносіны і пасведчэння іншых місій, патрэбуюць пасад і грошай*"[261].

Каб зразумець прычыны нястачы грошай, варта прааналізаваць баланс паміж прыбыткам і выдаткамі консульства БНР у латвійскай сталіцы, які адлюстроўвае табліца.

Табліца 4. Фінансавы баланс консульства БНР у Рызе за 1920 год

Прыбытак	
Астатак за 1919 г.	1 094,80 расійскіх рублёў 44 904,15 латвійскіх рублёў
Ахвяраванні грамадскасці	15 000 латвійскіх рублёў
Пазыкі	10 000 латвійскіх рублёў
Консульскія зборы	145 785 латвійскіх рублёў
Усяго	1 094,80 расійскіх рублёў 215 649,15 латвійскіх рублёў
Выдаткі	
Утрыманне консульства	127 651,64 латвійскіх рублёў, у тым ліку: – штатныя супрацоўнікі – 77 264 – пазаштатныя супрацоўнікі – 3 014 – асабістыя выдаткі служачым – 16 091 – утрыманне памяшканняў – 14 363 – канцылярскія выдаткі – 4 184 – прадстаўніцтва – 3 807 – друк бланкаў і абвестак – 4 360 – прэса – 1 830 – дапамога незаможным грамадзянам – 437 – зварот пазыкі – 2 000
Перададзена Радзе народных міністраў БНР	58 316,28 латвійскіх рублёў
Перададзена Вайскова-дыпламатычнай місіі БНР	1 094,80 рускіх рублёў 29 721,23 латвійскіх рублёў
Усяго	1 094,80 расійскіх рублёў 215 689,15 латвійскіх рублёў

Крыніца: НАРБ, ф. 864, воп. 1, спр. 10, л. 17, 21.

З аналізу звестак вынікае, што з бюджэт консульства амаль не меў дэфіцыту. Больш за тое, дзякуючы дзейнасці консульства, часткова ўдавалася ўтрымліваць ВДМ і нават урад БНР. Галоўнай крыніцай прыбытку былі консульскія зборы. Большая частка з іх прыпадае на першую палову года, калі сярод насельніцтва назіралася найбольшае зацікаўленне ў атрыманні

[261] Цыт. пав.: Ю. Юркевіч, *Стварэнне і дзейнасць Асобнага атрада БНР у Балтыі*..., с. 153.

беларускага грамадзянства. Да канца чэрвеня 1920 г. выручка ад гэтай дзейнасці склала 111 571 латвійскіх рублёў[262]. У падзеле на месяцы найбольшы прыбытак з консульскіх збораў быў атрыманы ў снежні і склаў амаль 29 тыс. латвійскіх рублёў[263]. Разам з тым, прыбыткаў консульства не хапала на фінансаванне паўнавартай дзейнасці прадстаўніцтваў БНР у Латвіі.

Грамадскія арганізацыі дыяспары

З'яўленне ў Латвіі прадстаўніцтваў БНР спрычынілася да актывізацыі беларускай дыяспары. З дапамогай кіраўніцтва ВДМ была створана Беларуская нацыянальная рада ў Латвіі (пазней – Рада Беларускай калоніі ў Латвіі) на чале са старшынём Якубам Данілюком і віцэ-старшынём Антонам Сцяпурам. 7 верасня 1919 г. адбыўся першы агульны сход беларусаў Рыгі, у якім удзельнічала больш як 500 чал. У выніку была абраная рада з 9 чалавек, а таксама яе прэзідыум у складзе Я. Данілюка (старшыня), А. Сцяпуры (віцэ-старшыня) і П. Цвяткова (сакратар). У тэлеграме да ўраду Латвіі ўдзельнікі сходу выказалі салідарнасць з імкненнем латвійскага народа да незалежнасці, а таксама надзею, што Беларусь і Латвія атрымаюць міжнароднае прызнанне[264]. 2 кастрычніка 1919 г. адбылося пасяджэнне Беларускай нацыянальнай рады ў Латвіі, на якім прысутнічаў К. Езавітаў. Кіраўнік ВДМ прывітаў суродзічаў ад імя ўрада БНР і паабяцаў ім шырокую арганізацыйную дапамогу. Удзельнікаў павітаў таксама Антон Борык ад імя Місіі БНР у Берліне. На гэтым пасяджэнні было вырашана стварыць камісію з 3 чалавек у справах дапамогі найбяднейшым беларусам Латвіі. Акрамя таго, удзельнікі абралі культурна-асветную камісію дзеля пашырэння беларусазнаўства. На старонках газеты "Сегодня" ад 4 кастрычніка 1919 г. К. Езавітаў заклікаў беларусаў Латвіі рэгістравацца ў Радзе[265].

Структуры БНР аказвалі арганізацыйную дапамогу эмігрантам. Напрыклад, Рада Беларускай калоніі ў Латвіі карысталася памяшканнем консульства БНР у Рызе[266]. У сваю чаргу дзеячы БНР разглядалі дыяспару як сацыяльную базу, на якую можна было абаперціся ў ажыццяўленні грамадска-палітычных задач і прадэманстраваць, што ўрад БНР карыстаецца падтрымкай грамадства. 30 кастрычніка 1919 г. у памяшканні Беларускай нацыянальнай рады ў Латвіі адбыўся сход сяброў з удзелам Я. Чарапука, які агучыў даклад пра

---

[262] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 62, л. 117.

[263] НАРБ, ф. 864, воп. 1, спр. 10, л. 19.

[264] E. Jekabsons, *Stosunki między Łotwą i Białoruską Republiką Ludową w latach 1919–1921*..., s. 52.

[265] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 143, л. 9.

[266] АБНР, т. 1, кн. 1, с. 559.

палітычную сітуацыю ў Беларусі. Ён падкрэсліў, што беларускі ўрад вярнуўся на радзіму і прыступае да арганізацыі адміністрацыйнага апарату, а латвійскім беларусам у Радзе БНР будзе адведзена адно месца. Удзельнікі сходу выказалі занепакоенасць сітуацыяй на радзіме ў сувязі з прысутнасцю там польскіх войскаў і прынялі рэзалюцыю, у якой пратэставалі супраць арышту палякамі Тамаша Грыба[267].

Пры Радзе Беларускай калоніі было створана Таварыства чырвонага крыжа (з сядзібай у Рызе), мэтай якога была арганізацыя медычнай дапамогі латвійскім беларусам, у тым ліку параненым жаўнерам, а таксама матэрыяльная дапамога бедным і хворым суайчыннікам. Таварыства існавала за сяброўскія складкі, ахвяраванні прыватных асоб і арганізацый, прыбытак ад канцэртаў, імпрэз і вечарын, выдавецкай дзейнасці, збораў ад грамадства[268]. 5 лістапада 1919 г. Рада беларускай калоніі ў Латвіі прыняла рэзалюцыю, выказаўшы падтрымку ўраду БНР і яго пастулату аб стварэнні беларускай дзяржавы ў этнаграфічных межах (з Вільняй і Віленшчынай), ухвалілі ідэю арганізацыі беларускага войска[269]. Падчас абароны латвійскай сталіцы ад арміі П. Бермонт-Авалава Рада Беларускай калоніі ў Латвіі далучылася да збору сродкаў для бедных родзічаў – жыхароў Рыгі. Намаганнямі кіраўніка ВДМ Рада Беларускай калоніі дэлегавала ў Менск прадстаўніка, які павінен быў узяць удзел у пасяджэнні Рады БНР (20 лістапада 1919 г.)[270]. 17 снежня 1919 г. у Рызе, у зале Латышскага таварыства, адбылося святкаванне другіх угодкаў склікання І Усебеларускага з'езда. Быў надрукаваны плакат з запрашэннем на латышскай, рускай і беларускай мовах[271]. З нагоды свята Рада беларускай калоніі ў Латвіі зладзіла канцэрт-баль на больш як 1,5 тыс. чал. Сярод запрошаных былі міністры латвійскага ўрада на чале з К. Ульманісам, старшыня Нацыянальнай рады Латвіі Яніс Чакстэ (*Jānis Čakste*), прадстаўнікі дыпламатычных місій краін Антанты і іншыя афіцыйныя асобы. Баль меў характар дабрачыннага мерапрыемства, падчас яго было сабрана звыш 20 тыс. латвійскіх рублёў ахвяраванняў. Падзея шырока асвятлялася на старонках латышскай і мясцовай рускамоўнай прэсы. У Рызе адбыўся таксама канцэрт беларускай народнай музыкі і спеваў, удзельнікі якога выступілі ў нацыянальных строях[272].

Актыўнасць дыяспары ў асноўным засяроджвалася ў Рызе. На думку кіраўніка ВДМ, на пачатку 1920 г. беларуская супольнасць у сталіцы налічвала не

---

[267] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 143, л. 15.

[268] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 92, л. 1–10.

[269] LCVA, f. 582, ap. 2, b. 32, l. 15.

[270] E. Jekabsons, *Stosunki między Łotwą i Białoruską Republiką Ludową w latach 1919–1921...*, s. 52.

[271] Slovanská knihovna (SK), Калекцыя беларускіх дакументаў, Плакат Рады беларускай калёніі ў Латвіі, 19 I 1919 г.

[272] АБНР, т. 1, кн. 1, с. 585, 586; E. Jekabsons, *Stosunki między Łotwą i Białoruską Republiką Ludową w latach 1919–1921...*, s. 53; НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 143, л. 16.

менш 2500 чал. Значную частку гэтых людзей складалі беларускія габрэі. На іх патрэбы ў Рызе была адчыненая беларуская сінагога[273]. Забягаючы наперад, варта адзначыць, што яна – пад назвай 1-ы Рыжскі беларускі дом малітвы габрэяў – праіснавала прынамсі да сярэдзіны 1920-х гг. Грамада тады налічвала не менш як 200 асоб[274].

Улады БНР разлічвалі, што эмігранты дапамогуць беларускай незалежніцкай справе не толькі маральна, але і матэрыяльна. 14 студзеня 1920 г. фінансавая камісія пры Радзе беларускай калоніі ў Рызе выдала адозву да суродзічаў з заклікам ахвяраваць грошы на карысць урада БНР[275]. Акрамя таго, Рада беларускай калоніі пазычыла консульству БНР 2 тыс. латвійскіх рублёў[276]. 1 лютага 1920 г. К. Езавітаў наступным чынам характарызаваў працу арганізацыі: "*Рада Калоніі працуе як толькі можа, збірае грошы, дапамагае консульству, выдае пасобіе бедным уцекачом, рабіць вечарыны, адчыняе ў хуткім часе клуб*"[277]. У іншым рапарце ён адзначаў, што, нягледзячы на матэрыяльныя цяжкасці, працы ў Латвіі прыбывае. Ён пісаў, што дыяспара праяўляе вялікую цікавасць да сітуацыі на Бацькаўшчыне і становішча нацыянальнага руху[278].

Беларускія дзеячы рабілі спробы ажывіць нацыянальную працу і ў правінцыі. 8 лютага 1920 г. у Ліепаі адбыўся сход мясцовых беларусаў, на якім была прынятая рэзалюцыя пра стварэнне мясцовай Беларускай рады[279].

---

[273] LCVA, f. 582, ap. 2, b. 32, l. 97.

[274] LVVA, 1370 f., 1 apr., 609 l., 30–31, 38, 47 lpp.

[275] У гэтай адозве чытаем: "*Ужо трэці год, як Беларусь паўстала да Дзяржаўнага Будаўніцтва і цяжка працуе над будучыняй Беларускай Народнай Рэспублікі. Многа зроблена за мінуўшыя два гады, але яшчэ працы ляжыць наперадзі. Спаленыя масты, мястэчкі і вёскі, паросшыя бур'янам і дзікім кустарнікам нівы, узрытыя акопамі сенажаці, доўгія і калючыя ленты провалачных загражденнёў, зруйнаваныя фабрыкі і заводы – усё гэта чакае ўпорнай і многакаштоўнай гаспадарскай працы. Адарваныя ад сваёй Многапакутнай Бацькаўшчыны і змушаныя працаваць тутака на чужыне, мы, на вялікі жаль, не можам прыняць безпасрэднага ўчасця ў вялікай і адпаведнай працы над яе адраджэннем. Але мы не маем права астацца зусім глухімі да таго, што робіцца ў Родным Краю, і павінны ўсімі спосабамі дапамагаць яму моцна ўстаць на ногі і заняць сярод іншых Дзяржаў Міра належачае яму па праву месца. Ведаючы цяжкае грашовае становішча Беларускай Народнай Рэспублікі і яе Ураду, мы найбольшую ўступную нам дапамогу можам аказаць Бацькаўшчыне дапамогай грашовай. І вось Фінансавая Камісія пры Радзе Беларускай Калёніі ў Латвіі зварачываецца да Вас, Грамадзяне, з прызывам споўніць свой грамадзянскі абавязак і падтрымаць Урад Беларускай Народнай Рэспублікі пачэсным пажэртваваннем у яго распараджэнне – кожным па дастатку яго*". НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 62, л. 138. Тамсама, спр. 69, л. 49.

[276] НАРБ, ф. 864, воп. 1, спр. 10, л. 39; НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 69, л. 47.

[277] АБНР, т. 1, кн. 1, с. 643.

[278] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 72, л. 33.

[279] АБНР, т. 1, кн. 1, с. 663, 675.

Яе сядзіба месцілася ў будынку мясцовага аддзелу ВДМ[280]. 10 лютага 1920 г. Беларуская рада ў Ліепаі накіравала зварот да прэзідэнта Латвіі,уў якім падкрэслівала добрасуседскія гістарычныя сувязі паміж беларускім і латвійскім народамі[281].

Дзеячы БНР рупіліся пра нацыянальна-культурную працу сярод эмігрантаў. З ініцыятывы К. Езавітава ў лютым 1920 г. быў заснаваны Рыжскі аддзел Беларускага культурна-асветнага таварыства "Бацькаўшчына". У кіраўніцтва гэтай арганізацыі ўвайшлі: Я. Данілюк, Даніла Кадоўба, Р. Казячы (сакратар), Міхась Маркевіч, Уладзімір Найдзёнаў, Уладзімір Пігулеўскі, Я. Чарапук і інш.[282] Сярод заснавальнікаў былі і беларускія габрэі[283]. Арганізацыя ахоплівала дзейнасцю Рыгу і ваколіцы, а сябрам мог быць кожны, хто меў беларускае грамадзянства[284]. Дзякуючы добрым кантактам К. Езавітава з латвійскімі ўладамі, у хуткім часе арганізацыя атрымала памяшканне ў самым сэрцы Рыгі (*Vaļņu iela 3*/5)[285]. Намаганнямі беларускага актыву ў горадзе ўдалося заснаваць Беларускі клуб, гурток моладзі, драматычны гурток, а таксама зладзіць курсы беларусазнаўства і стварыць "Грамаду медычных працаўнікоў". У сакавіку 1920 г. пры Радзе беларускай калоніі ў Латвіі быў створаны Жаночы (Дамскі) камітэт. Згодна са статутам, арганізацыя мела культурна-асветны і дабрачынны характар. На чале камітэта быў прэзідыум з 5 асоб. Камітэт дзейнічаў пад патранатам і наглядам Рады беларускай калоніі ў Латвіі. Праца камітэта падлягала рэвізіі прэзідыума Рады і рэвізійнай камісіі, якая абіралася на агульным сходзе. Жаночы камітэт меў адну прадстаўніцу ў Радзе беларускай калоніі ў Латвіі. Грошы на дзейнасць камітэт збіраў, арганізуючы вечарыны, канцэрты, публічныя лекцыі і іншыя мерапрыемствы[286]. Жаночы камітэт, як і курсы беларусазнаўства, месціліся ў памяшканні консульства БНР[287].

Беларускія дзеячы Латвіі спрабавалі выдаваць уласную прэсу. 27 снежня 1919 г. К. Езавітаў прасіў К. Дуж-Душэўскага прызначыць 4 тыс. латвійскіх рублёў на выданне ілюстраванага часопіса "На чужыне"[288]. Намаганнямі беларускай калоніі ў сакавіку 1920 г. у Рызе быў выдадзены адзіны нумар гэтага літаратурна-грамадскага штомесячніка. Выданне было наладжана пры

---

[280] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 72, л. 334 зв.

[281] ERA, f. 957, n. 11, s. 259, l. 9.

[282] Н. Голубева, *Беларусы ў Латвіі* [у:] *Беларускае замежжа*, рэд. Н. Голубева, Менск 2010, с. 194–195.

[283] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 76, л. 11–12.

[284] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 76, л. 1–10.

[285] Зараз гэта Mazā Vaļņu iela.

[286] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 106, л. 144.

[287] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 72, л. 334 зв.

[288] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 46, л. 5.

падтрымцы консульства БНР. Рэдакцыя знаходзілася ў будынку консульства, а галоўным рэдактарам з'яўляўся сакратар консульства Р. Казячы. Выдаўцом выступіў Рыжскі аддзел Беларускага культурна-прасветнага таварыства "Бацькаўшчына". Захаваліся сціплыя звесткі пра выданне часопіса. Вядома, што нумар быў надрукаваны ў сталічнай друкарні Э Левіна. Часопіс пісаў пра жыццё беларускай калоніі ў Балтыі, прапагандавалі ідэю незалежнасці Беларусі, давалі агляд беларускага друку. Часопіс "На чужыне" заклікаў суродзічаў дапамагаць беларускай справе: "*З трэпетам сэрца слядзім мы, апынуўшыяся на чужыне, за гэтай барацьбой, цешымся з кожнай самай маленечкай удачы і горка сумуем, калі бачым няўспехі нашых братоў. Але ў гэтай барацьбе мы не павінны астацца толькі сведкамі. У гэтым цяжкім змаганні мы павінны дапамагчы нашым братом усім, чым толькі можам: і маральным падтрыманнем, і грашмі, і аружнай сілай. Першыя крокі ў гэтым кірунку ўжо зроблены. Ужо мы не раскіданыя па ўсяму свету асобамі, адарванымі друг ад друга адзінкамі, ужо мы згуртаваліся на чужыне ў Калоніі, ужо маем свае нацыянальныя ўстановы, але гэта першы крок. За ім павінна ісці аб'яднанне ўсіх зарубежных беларусаў, каб агульнымі сіламі ратаваць Бацькаўшчыну. Каб пасабіць гэтаму аб'яднанню, каб выявіць усе беларускія сілы, працуючы на чужыне, каб злучыць іх у моцны звязак і працягнуць руку помачы нашым змучаным братом на Бацькаўшчыне – выпускаем гэты нумар штомесячніка. Крэпка гуртуйцеся каля яго, беларусы!*"[289]. Большасць артыкулаў належала ананімным аўтарам. З'яўленне часопіса было заўважана латвійскай прэсай. Выданне "Latvijas Kareivis" у нумары ад 11 лютага 1920 г. інфармавала, што беларускі часопіс будзе рыхтавацца да друку найлепшымі прадстаўнікамі беларускіх культурных і мастацкіх колаў Латвіі і Эстоніі[290].

Дыяспара знаходзілася ў шчыльным кантакце з уладамі БНР і мусіла трымацца палітычнай лініі ўрада. Гэтым належыць тлумачыць з'яўленне некаторых дэкларацый палітычнага характару. Напрыклад, 18 сакавіка 1920 г. у Рызе адбыўся сход прадстаўнікоў беларускіх грамадскіх арганізацый Латвіі (Рада беларускай калоніі ў Латвіі, Беларускае культурна-асветнае таварыства "Бацькаўшчына"), на якім была абмеркаваная рэзалюцыя Цэнтральнай беларускай рады Віленшчыны і Гарадзеншчыны. Прысутныя ўхвалілі рэзалюцыю, выказаўшы поўную падтрымку ўраду В. Ластоўскага ў яго змаганні за незалежнасць Беларусі. У дакуменце падкрэслівалася, што прадстаўнікі беларускага ўрада павінны ўзяць удзел з правамоцным голасам у мірных перамовах паміж Польшчай, Латвіяй і Савецкай Расіяй, паколькі іх змест тычыцца жыццёвых інтарэсаў беларускага народу. Адзначалася, што ў выпадку невыканання патрабаванняў беларускі бок не прызнае вынікаў перамоў,

[289] *Стацьця рэдакцыі*, "На чужыне" 1920, № 1, с. 1.

[290] ERA, f. 957, n. 11, s. 259, l. 7.

а народ Беларусі будзе змагацца супраць этнаграфічнай, гістарычнай і эканамічнай несправядлівасці[291]. Гэта не быў адзіны раз, калі беларуская калонія Латвіі рэагавала на падзеі "вялікай палітыкі". 10 лістапада 1920 г. Рада беларускай калоніі ў Рызе на нарадзе асудзіла "захопніцкія дзеянні" ген. Станіслава Булак-Балаховіча і ген. Люцыяна Жалігоўскага, якія пад выглядам літоўска-беларускіх войскаў "*з'яўляюцца стаўленнікамі польскага імперыялізму і нічога агульнага не маюць з беларускім вызвольным рухам*"[292].

Завяршальны этап і ліквідацыя органаў БНР у Латвіі

Раскол у кіроўных колах БНР і зменлівая ваенна-палітычная сітуацыя ў рэгіёне патрабавала ад беларускіх палітыкаў крокаў па каардынацыі дзейнасці незалежніцкага лагера. У гэтым працэсе прадстаўнікам БНР у Латвіі было наканавана адыграць не апошнюю ролю. Ключавой фігурай сярод мясцовых беларускіх дзеячаў з'яўляўся К. Езавітаў, які ў рэшце рэшт падтрымаў В. Ластоўскага. Апошні на пачатку 1920 г. вызваліўся з кароткачасовай польскай няволі і прыступіў да кансалідацыі прыхільнікаў вакол свайго ўрада. У асяроддзі прэм'ера з'явілася задума склікаць палітычную канферэнцыю беларускага актыву. 20 лютага 1920 г. К. Езавітаў у лісце В. Ластоўскаму падтрымаў гэтую ідэю, але папярэджваў, што з фінансавых прычынаў не зможа аформіць сабе замежную камандзіроўку і прапанаваў абраць Рыгу ў якасці месца, куды маглі б з'ехацца беларускія палітыкі[293]. Прапанова спадабалася В. Ластоўскаму і яго прыхільнікам. На пачатку красавіка 1920 г. прэм'ер паінфармаваў К. Езавітава, што ў хуткім часе плануецца прыезд у Рыгу сяброў урада БНР. У сувязі з гэтым В. Ластоўскі прасіў падрыхтаваць іх візіты ў латвійскія ўрадавыя ўстановы, а таксама забяспечыць беларускім палітыкам матэрыяльнае ўтрыманне на час знаходжання ў латвійскай сталіцы. Кіраўнік ВДМ выказаў сумнеў наконт апошняй просьбы з прычыны адсутнасці грошай[294].

У хуткім часе ў сталіцу Латвіі пачалі з'язджацца кіраўнікі БНР. 3–4 красавіка 1920 г. у Рызе адбылася канферэнцыя прадстаўнікоў беларускіх сацыялістычных партый (Я. Чарапук – ад эсэраў, Р. Казячы, К. Езавітаў і Ю. Гладкі – ад сацыялістаў-федэралістаў, К. Дуж-Душэўскі – ад сацыял-дэмакратаў), удзельнікі якой ухвалілі рэзалюцыю пра скліканне 15 красавіка 1920 г. кангрэсу сацпартый, на якім планавалася абмеркаваць наступныя пытанні: 1) будучае дзяржаўнае будаўніцтва Беларусі і 2) стаўленне да

[291] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 106, л. 195.
[292] НАРБ. ф. 325, воп. 1, спр. 106, л. 244.
[293] АБНР, т. 1, кн. 1, с. 674.
[294] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 46, л. 37.

Расіі і Польшчы[295]. У пэўны момант гаворка ішла нават аб скліканні ў Рызе "Вялікага беларускага кангрэсу". Аднак у сувязі з фінансавымі цяжкасцямі арганізатары мусілі адмовіцца ад амбітнай задумы, абмежаваўшыся назвай "беларуская дзяржаўная канферэнцыя". 18 красавіка 1920 г. у сталіцы Латвіі адбыўся сход ініцыятыўнай групы па скліканні беларускай дзяржаўнай канферэнцыі, у якім удзельнічалі В. Ластоўскі, К. Езавітаў, Язэп Варонка, Я. Чарапук, Алесь Карабач, Р. Казячы, Ю. Гладкі[296]. 25 красавіка 1920 г. у Рызе было ўтворана бюро па скліканні вышэйзгаданай канферэнцыі. У яго склад увайшлі: К. Езавітаў – як кіраўнік ВДМ і прадстаўнік фракцыі БПС-Ф, В. Ластоўскі – як прэм'ер, Я. Мамонька – як сакратар Рады БНР, Аляксандр Вальковіч – як сябра Рады БНР і прадстаўнік фракцыі БПС-Р, Я. Чарапук – як сябра Рады БНР і прадстаўнік фракцыі БПС-Р. Арганізатары канферэнцыі вырашылі запрасіць да ўдзелу ў ёй чальцоў урада БНР, Прэзідыума Рады БНР і сеньёр-канвенту Рады БНР, лідараў палітычных партый, прадстаўнікоў Саюза кааператываў, Беларускай рады Віленшчыны і Гарадзеншчыны, Нацыянальнага камітэта Меншчыны, Рады беларускай калоніі ў Латвіі[297].

У траўні 1920 г. у Рыгу прыбылі сябры Прэзідыума Рады БНР – Васіль Захарка, Пётра Крачэўскі, Палута Бадунова і іншыя. Такім чынам, у Рызе апынулася амаль усё кіраўніцтва БНР – чальцы ўрада і Прэзідыума Рады БНР, якія прыехалі з розных куткоў Еўропы. На некалькі месяцаў латвійская сталіца ператварылася ў галоўны асяродак беларускай незалежніцкай дзейнасці, стала чарговай "сталіцай" БНР. Адначасова на латвійскай зямлі адбыўся шэраг сходаў актыву партый, якія салідарызаваліся з урадам В. Ластоўскага. 25–30 траўня 1920 г. у Рызе прайшла канферэнцыя БПС-Ф, на якой была прынята рэзалюцыя (падпісалі, між іншым, К. Езавітаў і Ю. Гладкі) пра давер да ўрада В. Ластоўскага[298]. 30–31 траўня адбылася нарада сябраў Прэзідыума і ўрада БНР, на якой быў разгледжаны бягучы стан беларускай справы. Удзельнікі даручылі ўраду В. Ластоўскага шукаць шляхі збліжэння з краінамі Антанты і патрабаваць ад іх прызнання незалежнасці БНР. Беларускія эсэры зрабілі спробу наладзіць супрацоўніцтва з Савецкай Расіяй. Дзеля гэтага з іх ініцыятывы яшчэ ў сакавіку вяліся перамовы з прадстаўнікамі бальшавікоў, пра вынікі якіх распавяла П. Бадунова. Яна падкрэсліла, што падчас перамоў у Маскве з наркамам па справах нацменшасцей Іосіфам Сталіным і іншымі бальшавіцкімі лідарамі апошнія выказалі разуменне беларускіх незалежніцкіх пастулатаў ("*калі народ зажадае незалежнасці на мясцох – яна будзе дадзена*"). Беларускія эсэры дэкларавалі гатоўнасць

[295] АБНР, т. 1, кн. 1, с. 714.
[296] АБНР, т. 1, кн. 1, с. 721–722.
[297] АБНР, т. 1, кн. 1, с. 727–728.
[298] АБНР, т. 1, кн. 1, с. 770.

весці перамовы з уладамі РСФСР, але пры ўмове "*прызнання поўнай дзяржаўнай незалежнасці і суверэннасці БНР*". Улетку 1920 г. з Рыгі на перамовы ў Маскву скіравалася дэлегацыя БНР на чале з В. Захаркам. Адным з заданняў дэлегацыі было атрыманне ад бальшавікоў дзяржаўнай пазыкі ў памеры 50 мільёнаў рублёў. Тым часам заданне прадстаўляць інтарэсы БНР на Парыжскай канферэнцыі было даручана Яўгену Ладнову. Нарада дазволіла склікаць у Рызе беларускія партыйныя канферэнцыі пры ўмове, што на гэта пагодзяцца ўлады Латвіі[299].

У працяг дадзенага рашэння на другі дзень, 1 чэрвеня 1920 г., у Рызе адбылася канферэнцыя беларускіх дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў, на якой быў прыняты шэраг рэзалюцый: 1) пра неабходнасць эканамічна-гандлёвых кантактаў з еўрапейскімі дзяржавамі, 2) пра патрабаванне ад Антанты прызнання БНР, 3) пра падтрымку палітыкі ўрада В. Ластоўскага. Дакументы падпісалі: А. Вальковіч (старшыня), Э. Сангайла-Станевіч (сакратар і старшыня БПС-Р), Я. Чарапук (прадстаўнік БПС-Р), К. Езавітаў (прадстаўнік БПС-Ф), А. Сцяпура (прадстаўнік сацыял-дэмакратаў), Я. Мамонька (прадстаўнік кааператываў)[300].

8 чэрвеня 1920 г. у Рыгу прыбыў прэм'ер В. Ластоўскі з жонкай. Кіраўнік ВДМ звярнуўся да МЗС Латвіі з просьбай даць беларускай пары дазвол на доўгатэрміновае знаходжанне ў краіне ("на дачны сезон")[301]. Разам з прыбыццём у Латвію значнай часткі беларускіх палітыкаў узнікла пытанне пра ўрэгуляванне іх статусу на тэрыторыі краіны. Удзельнікі вышэйзгаданай нарады чальцоў Прэзідыума і ўрада вырашылі звярнуцца да латвійскіх уладаў з просьбай дазволіць беларускаму ўраду часова знаходзіцца ў Рызе. Дамаўляцца пра гэта давялося кіраўніку ВДМ. Дзякуючы захадам К. Езавітава, удалося зладзіць шэраг сустрэч прэм'ера БНР з чальцамі ўрада Латвіі, у тым ліку з прэм'ерам К. Ульманісам. У прысутнасці К. Езавітава беларускі прэм'ер сустрэўся з Янісам Чакстэ і Янісам Райнісам (*Jānis Rainis*). Першы падчас аўдыенцыі В. Ластоўскага адзначыў, што 4/5 сяброў Устаноўчага Сойму падтрымаюць ідэю шчыльнейшых сувязей з Беларуссю[302].

8 чэрвеня 1920 г. прэм'ер загадаў К. Езавітаву асабіста даваць яму штодзённыя рапарты пра дзейнасць ВДМ. Прэм'ер тлумачыў гэта неабходнасцю валодаць інфармацыяй пра сітуацыю ў Балтыі. Больш за тое, В. Ластоўскі лічыў, што раней Вайскова-дыпламатычная місія вяла працу, якая выходзіла за яе кампетэнцыі, таму зараз хацеў мацней кантраляваць яе[303]. Акрамя таго,

---

[299] АБНР, т. 1, кн. 1, с. 766–768.

[300] АБНР, т. 1, кн. 1, с. 773.

[301] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 72, л. 306.

[302] LCVA, f. 368, ap. 1, b. 31, l. 12–28.

[303] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 46, л. 65.

прэм'ер хацеў актывізаваць мясцовую беларускую калонію, каб далучыць яе да фінансавання свайго ўрада. У сувязі з гэтым ён даручыў К. Езавітаву склікаць сустрэчу грамадзян БНР – рыжан, купцоў і прамыслоўцаў з прапановай абраць дэлегата на міжнародную гандлёвую канферэнцыю[304].

Латвійскі бок аказаўся даволі гасцінным у дачыненні да дзеячаў БНР. На тэрыторыі Латвіі беларусы знайшлі бяспечны прытулак, а беларускія ўстановы маглі праводзіць палітычную і дыпламатычную працу. Нягледзячы на тое, што Латвія афіцыйна не прызнала незалежнасці БНР, латвійскі ўрад выдаткаваў невялікую суму грошай на патрэбы беларускіх палітыкаў, якія знаходзіліся ў Рызе. Гэта сведчыць пра тое, што ўлады ў Рызе нейкі час лічылі, што беларуская дзяржаўнасць можа стаць фактам і жадалі будаваць добрасуседскія адносіны. Аднак з цягам часу да латышоў прыходзіла разуменне, што намаганні беларускіх палітыкаў атрымаць міжнароднае прызнанне БНР скончацца паразай. У сувязі з гэтым падтрымка беларускай дыпламатыі ставілася пад пытанне. У гэты ж час адбылося некалькі непрыемных інцыдэнтаў з удзелам беларускіх палітыкаў. Сакратар Рады БНР Я. Мамонька 7 чэрвеня 1920 г. быў затрыманы латвійскімі памежнікамі на мяжы, па дарозе з Рыгі ў Менск. Падчас затрымання ў яго было сканфіскавана 14 600 расійскіх рублёў, прызначаных на заробак міністрам БНР. Беларус быў транспартаваны ў Рыгу, дзе ў хуткім часе выйшаў на волю. Палітык сцвярджаў, што латвійскія вайскоўцы на мяжы паводзіліся з ім па-хамску, а мытнік, не зважаючы на дыпламатычны пашпарт, заявіў, што не прызнае дыпламатаў неіснуючай дзяржавы. У сваю чаргу штаб аховы памежнай варты Латвіі прадставіў інцыдэнт у іншым святле, сцвярджаючы, што Я. Мамонька не дазволіў праверыць свой багаж. Сканфіскаваныя грошы былі вернутыя беларускаму боку, але інцыдэнт адмоўна паўплываў на адносіны паміж беларускімі дыпламатамі і ўрадам Латвіі[305].

У хуткім часе адбыўся яшчэ большы інцыдэнт, які ахаладзіў латвійска-беларускія ўзаемадачыненні. 29 ліпеня 1920 г. беларускі бок звярнуўся да ўрадаў краін Балтыі з просьбай разгледзець магчымасць уключэння дэлегацыі БНР у склад удзельнікаў Канферэнцыі балтыйскіх дзяржаў. У жніўні 1920 г. была сфарміраваная беларуская дэлегацыя ў складзе Я. Чарапука, У. Пігулеўскага, А. Галавінскага і інж. Саламона Мінца[306]. Кіраўнік ВДМ звярнуўся да міністраў замежных спраў краін-удзельніц з просьбай даць інструкцыі сваім дэлегацыям з тлумачэннем неабходнасці ўключэння беларускай дэлегацыі ў працу канферэнцыі. Кастусь Езавітаў абгрунтоўваў патрэбу ўдзелу беларусаў у балтыйскім супрацоўніцтве геапалітычнымі і эканамічнымі

[304] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 46, л. 66.

[305] E. Jekabsons, *Stosunki między Łotwą i Białoruską Republiką Ludową w latach 1919–1921...*, s. 59.

[306] НАРБ, ф. 325. воп. 1, спр. 59, л. 161.

меркаваннямі (шляхі зносін, чыгунка, рынак збыту і перапрацоўка сыравіны, масток паміж Балтыяй і чарнаморска-каўказскім рэгіёнам). Палітык падкрэсліваў, што выключэнне Беларусі значна аслабіць эканамічную і вайсковую стабільнасць у балтыйскім рэгіёне[307]. У падобным тоне быў вытрыманы мемарандум (12 жніўня 1920 г.) прэм'ера В. Ластоўскага да прэзідыума Канферэнцыі балтыйскіх дзяржаў. Аўтар падкрэсліваў неабходнасць супрацоўніцтва краін рэгіёну дзеля супрацьстаяння варожаму імперыялізму[308]. Беларускі бок патрабаваў дапусціць беларусаў да ўдзелу ў канферэнцыі з правам голасу. Беларусы разлічвалі, што праз удзел у канферэнцыі ім удасца правесці шырокую палітычную агітацыю на карысць незалежнасці Беларусі, а таксама атрымаць маральную і матэрыяльную дапамогу[309]. Аднак у жніўні 1920 г. латвійскі бок не дазволіў дэлегацыі ВДМ узяць удзел у Канферэнцыі балтыйскіх дзяржаў, якая адбылася ў мясцовасці Булдуры (каля Рыгі)[310]. Пазіцыю Латвіі належыць разглядаць як праяву халоднага палітычнага разліку ў тагачаснай сітуацыі, якая не спрыяла кантактам з беларусамі. 11 жніўня 1920 г. у Рызе была падпісана мірная дамова паміж Латвіяй і Савецкай Расіяй. Латвія абавязвалася не падтрымліваць антысавецкія рухі ўзамен за дыпламатычнае прызнанне незалежнасці з боку бальшавікоў. У сувязі з гэтым латвійскі бок намагаўся пазбыцца прысутнасці "палітычна нязручных" прадстаўніцтваў БНР. Менавіта таму ў верасні 1920 г. міністр замежных спраў Латвіі неаднаразова адмовіўся даць аўдыенцыю прадстаўніку ВДМ, спасылаючыся на мірнае пагадненне з РСФСР[311].

Нягледзячы на пагаршэнне стаўлення латвійскіх улад да беларускіх незалежнікаў, Рыга працягвала заставацца істотным асяродкам беларускага палітычнага жыцця. Тым больш, што ў сталіцу Латвіі з Менску былі перанесеныя польска-расійска-ўкраінскія мірныя перамовы, якія павінны былі вызначыць абрысы палітычнай мапы ўсходняй Еўропы на бліжэйшыя гады. Знаходзячыся ў Рызе, урад БНР працягваў рабіць захады, каб атрымаць міжнароднае прызнанне ад розных бакоў: Польшчы, Антанты, РСФСР, Латвіі. 3 верасня 1920 г. у Рызе адбылася сустрэча П. Бадуновай, Я. Чарапука, М. Маркевіча, Я. Мамонькі, К. Езавітава, А. Вальковіча і В. Ластоўскага, на якой былі абмеркаваныя вынікі няўдалай "маскоўскай місіі". У сувязі з тым, што не спраўдзіліся надзеі дамовіцца з бальшавікамі, беларускія дзеячы былі вымушаны падкарэктаваць знешнепалітычныя планы і ў супрацьвагу

---

[307] ERA, f. 957, n. 11, s. 259, l. 35–36.

[308] ERA, f. 957, n. 11, s. 672, l. 10–15.

[309] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 714.

[310] E. Jekabsons, *Stosunki między Łotwą i Białoruską Republiką Ludową w latach 1919–1921*..., s. 59.

[311] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 106, л. 238.

Маскве шукаць кантактаў з палякамі. На пачатку верасня 1920 г. у Рызе адбылася нефармальная сустрэча В. Ластоўскага з чальцом польскай дэлегацыі на Рыжскай мірнай канферэнцыі і блізкім паплечнікам Ю. Пілсудскага Леонам Васілеўскім. Акрамя таго, 7 верасня 1920 г. беларускі прэм'ер выслаў з Рыгі ноту ў МЗС Польшчы, прапануючы прызнаць незалежнасць БНР[312]. 2 і 4 кастрычніка 1920 г. у Рызе пры пасрэдніцтве кіраўніка МЗС Латвіі З. Мееровіцса адбылася сустрэча беларускіх палітыкаў (В. Ластоўскага, А. Цвікевіча, А. Аўсяніка) з прадстаўнікамі польскай дэлегацыі на Рыжскай мірнай канферэнцыі. Інтарэсы бакоў былі, аднак, рознымі: беларусы чакалі прызнання БНР з боку Польшчы, у той час як палякі прасілі, каб беларусы спынілі спробы далучыцца да мірнай канферэнцыі[313]. Прадстаўнікі БНР не дасягнулі сваіх мэтаў. Польскі бок пагадзіўся адзінае на ўдзел прадстаўніка МЗС БНР Я. Чарапука ў пленарным пасяджэнні Рыжскай мірнай канферэнцыі. Непрыхільнае стаўленне да ўдзелу беларусаў у перамовах з бальшавікамі можна патлумачыць адмовай палякаў ад федэралісцкіх планаў на карысць падзелу спрэчных тэрыторый паміж Варшавай і Масквой. На думку некаторых гісторыкаў, па-іншаму сябе паводзіць польскі бок не мог, паколькі ўрад В. Ластоўскага прадстаўляў альтэрнатыўны варыянт тэрытарыяльна-дзяржаўнага ўпарадкавання беларускіх земляў і не адпавядаў таму, які яшчэ ўлетку 1920 г. у Менску ўзгаднілі польскі і савецкі бакі[314].

28 верасня 1920 г., на наступны дзень пасля прыезду ў Рыгу сяброў берлінскай дэлегацыі БНР (Пятра Крачэўскага, Аляксандра Галавінскага, Аляксандра Цвікевіча і Антона Аўсяніка), у латвійскай сталіцы адбыўся сход чальцоў ураду і Прэзідыума Рады БНР, у якім узялі ўдзел: старшыня Прэзідыума Рады БНР П. Крачэўскі, яго намеснік В. Захарка, сакратар Прэзідыума Я. Мамонька, прэм'ер В. Ластоўскі, міністр юстыцыі А. Цвікевіч, міністр фінансаў А. Вальковіч і дзяржсакратар К. Езавітаў. Апошні прадставіў рэферат пра стаўленне Латвіі і Эстоніі да БНР, якое ахарактарызаваў як лаяльнае. Тым часам, пазіцыю Літвы да беларускага руху ўдзельнікі нарады ахарактарызавалі як "варожую". Шукаючы хаўруснікаў, беларускія дзеячы намагаліся ўзмацніць супрацоўніцтва з украінцамі. На нарадзе было вырашана даручыць К. Езавітаву і А. Цвікевічу пачаць перамовы з УНР у справе фарміравання беларускіх вайсковых аддзелаў ва Украіне пры ўмове, што яны не будуць падпарадкоўвацца палякам. Беларусы ўсталявалі таксама кантакты з палітыкамі

---

[312] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 861–864; А. Чернякевич, *БНР: Триумф побежденных*, Минск 2018, с. 177.

[313] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 900.

[314] М. Мязга, *Пазіцыя Польшчы адносна ўдзелу беларускай дэлегацыі ў савецка-польскіх мірных перамовах (жнівень 1920 – сакавік 1921 г.)*, "Rocznik Centrum Studiów Białoruskich" 2022, t. 8, s. 68, 70.

Заходнеўкраінскай народнай рэспублікі (ЗУНР), якія знаходзіліся ў Рызе[315]. 8 кастрычніка 1920 г. дэлегацыя БНР і ЗУНР выдалі супольны пратэст "Да ўсіх" у сувязі з падпісаннем польска-савецкага прэлімінарнага міру[316].

Урад БНР роспачна шукаў магчымасці далучыцца да працы Рыжскай мірнай канферэнцыі. 2 кастрычніка 1920 г. беларуская дэлегацыя выдала дэкларацыю да ўдзельнікаў канферэнцыі, якая ўтрымлівала пратэст супраць таго, што Польшча і Савецкая Расія незаконна выступаюць у ролі гаспадароў беларускай зямлі[317]. 5 кастрычніка 1920 г. дэлегацыя БНР ухваліла чарговую дэкларацыю да прэзідыума Рыжскай мірнай канферэнцыі, патрабуючы дапусціць яе да ўдзелу. У дакуменце падкрэслівалася, што трывалы мір паміж Польшчай і РСФСР магчымы толькі пры ўмове, калі абодва бакі адмовяцца ад захопу Беларусі, а гэта павінна адбыцца ў выніку прызнання бакамі незалежнасці БНР і перамоў з яе ўрадам[318].

20 кастрычніка 1920 г. у Рызе адбылася нацыянальна-палітычная канферэнцыя прадстаўнікоў беларускіх палітычных партый, скліканая ў сувязі польска-бальшавіцкімі перамовамі, а таксама – з абвяшчэннем Сярэдняй Літвы. У сустрэчы ўзялі ўдзел прадстаўнікі эсэраў (В. Ластоўскі, Я. Мамонька, К. Дуж-Душэўскі, А. Галавінскі, А. Вальковіч, Я. Чарапук), сацыялістаў-федэралістаў (П. Крачэўскі, В. Захарка, Я. Варонка, К. Езавітаў) і сацыял-дэмакратаў (А. Аўсянік). Удзельнікі ставілі за мэту стварыць вакол урада В. Ластоўскага беларускі палітычны блок, здольны звярнуць увагу свету на пытанне незалежнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі. Прысутныя выдалі рэзалюцыю, у якой асуджалі перамовы паміж РСФСР і Польшчай без удзелу БНР. У дакуменце сцвярджалася, што Варшава і Масква выяўляюць імперыялістычныя памкненні ў дачыненні да беларускага народа. У сувязі з гэтым абвяшчалася, што польска-савецкае прэлімінарнае перамір'е 12 кастрычніка 1920 г. з'яўляецца несапраўдным. Удзельнікі пастанавілі ўсімі сродкамі змагацца за незалежнасць і непадзельнасць БНР "з усімі яе ворагамі"; патрабаваць абавязковага ўдзелу дэлегацыі БНР у мірных перамовах. Дзейнасць ураду БНР прызнавалася слушнай і адпаведнай волі беларускага народа. На другі дзень удзельнікі патрабавалі ад савецкага і польскага бакоў "*устанаўлення дзяржаўных расійска-беларускіх і беларуска-польскіх граніц па этнаграфічнаму прынцыпу*", а таксама "*ачышчэння этнаграфічнай беларускай тэрыторыі ад акупанцкіх, як польскіх, так і расейскіх войскаў*". Рэзалюцыя ўтрымлівала заклік да польскіх і расійскіх сацыялістаў падтрымаць беларусаў у справядлівых патрабаваннях і паўплываць на свае ўрады, каб не

[315] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 885–887.
[316] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 905–906.
[317] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 897–898.
[318] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 901–902.

ўцягнуць працоўных у новую вайну за беларускія землі. Абвяшчалася непрызнанне польска-савецкага міру ў выпадку яго падпісання[319].

Беларускія палітыкі, хоць і не змаглі атрымаць дазвол на ўдзел у польска-савецкіх перамовах, паўплывалі на савецкі бок. Пасля вышэйзгаданых дэмаршаў дзеячаў БНР ён быў вымушаны ўлічваць беларускае пытанне ў сваіх геапалітычных планах. Савецкія дыпламаты, якія раней ігнаравалі міжнародную актыўнасць уряду БНР, выклікалі ў Рыгу прадстаўнікоў уряду Савецкай Беларусі, каб стварыць супрацьвагу незалежнікам[320].

На беларускую дзейнасць мусілі рэагаваць і палякі, з якімі палітыкі БНР у Рызе працягваліся кантактаваць. З польскага боку кантакты з беларусамі падтрымлівалі Вітальд Камянецкі і Леон Васілеўскі. У кастрычніку першы запрасіў прэм'ера В. Ластоўскага на перамовы[321]. З беларусамі меў кантакты агент польскай выведкі Рамуальд Нагольма, які знаходзіўся ў латвійскай сталіцы і сачыў за ходам перамоў. Ён даў цікавую характарыстыку мясцовым беларускім дзеячам, сцвярджаючы, што яны "*належаць да аднаго тыпу людзей эмацыйных, уражлівых, імпульсіўных, часта дактрынатары і падаюцца пачуццю нянавісці*"[322]. Апошнюю рысу ён прыпісваў К. Езавітаву. Астатніх беларускіх палітыкаў польскі агент лічыў сумленнымі і непрадажнымі людзьмі, адданымі сваёй справе. Ён сцвярджаў, што беларусы вельмі ўпартыя і дамовіцца з імі цяжка. Паводле польскага агента, польска-беларускія адносіны ўвайшлі ў найгоршую фазу, асабліва пасля таго, як беларускім палітыкам у Рызе стала вядома пра захоп Вільні войскамі ген. Л. Жалігоўскага[323].

Час ішоў і ён не быў на карысць дзеячаў БНР, якія апынуліся ў Рызе. Варта нагадаць, што яны знаходзіліся ў кепскіх матэрыяльных умовах. Вось як характарызаваў сітуацыю вышэйзгаданы Р. Нагольма: "*Зараз, як і на працягу ўсяго часу свайго знаходжання ў Рызе, урад Ластоўскага знаходзіўся ў самым фатальным матэрыяльным становішчы. Дзеля эканоміі ўсе сябры групы жылі і елі разам на Нікалаеўскай, у памяшканні місіі, на чале якой стаяў плк. Езавітаў. Чыноўнікі даўно не атрымлівалі ніякага заробку. Праз адсутнасць сродкаў урад Ластоўскага не меў ніякага кантакту са знешнім светам, з беларускай групай у Варшаве, ані з ген. Балаховічам*"[324]. Адносіны з латвійскім бокам таксама не былі простымі.

---

[319] АБНР, к. 1, ч. 2, с. 918–920.

[320] А. Горны, *Ад юрыста да прэм'ера, БНР і гісторыка: жыццёвы шлях Аляксандра Цвікевіча* [у:] А. Цвікевіч, *Збор твораў*, т. 1 *Гістарычныя працы*, Смаленск 2021, с. 30.

[321] *Węzeł polsko-białoruski 1918–1921. Dokumenty i materiały*, Warszawa 2018, s. 604.

[322] *Węzeł polsko-białoruski 1918–1921. Dokumenty i materiały*, Warszawa 2018, s. 663–665.

[323] Тамсама.

[324] *Węzeł polsko-białoruski 1918–1921. Dokumenty i materiały*, Warszawa 2018, s. 663.

З аднаго боку, латышы дазвалялі беларускім палітыкам знаходзіцца на сваёй тэрыторыі, а з іншага – не давалі надзеі на прызнанне БНР. Яскрава гэта засведчыла сустрэча прадстаўнікоў урадаў БНР і Латвіі 9 кастрычніка 1920 г. Беларускі бок закрануў пытанне допуску дэлегацыі БНР да савецка-польскіх перамоў. Латышы паставіліся са разуменнем да беларускіх жаданняў, але адзначылі, што пытанне могуць вырашаць толькі ўдзельнікі перамоў[325]. З пратаколу супольнага сходу ўраду і Прэзідыума Рады БНР ад 22 кастрычніка 1920 г вынікае, што латвійскі ўрад не пярэчыў супраць далейшага знаходжання беларускіх палітыкаў на сваёй тэрыторыі і нават даў ім 25 тыс. латвійскіх рублёў пазыкі[326]. Магчыма, гэты крок матываваў беларусаў працягваць дыпламатычныя крокі, каб зацікавіць балтаў справай беларускай незалежнасці. 27 кастрычніка 1920 г. урад БНР звярнуўся да ўрадаў балтыйскіх дзяржаў з просьбай пра палітычную і грашовую дапамогу БНР[327]. У спецыяльным мемарандуме беларускі бок тлумачыў, якую карысць атрымаюць краіны Балтыі ад існавання незалежнай дэмакратычнай беларускай дзяржавы. Аўтары былі перакананыя, што далучэнне Беларусі да шчыльнага супрацоўніцтва з балтыйскімі дзяржавамі дасць магчымасць стварыць буферную зону паміж РСФСР і Балтыяй. Падкрэслівалася небяспека і пагроза (напрыклад, ізаляцыя Балтыі ад Чарнаморскага ўзбярэжжа, аслабленне ролі балтыйскіх партоў у міжнародным гандлі), якую ствараў падзел беларускіх земляў паміж Польшчай і Савецкай Расіяй. Адначасова беларускі бок прасіў ва ўрадаў балтыйскіх краін дазволу стварыць на іх тэрыторыі базы фарміравання беларускага войска, а таксама вылучыць крэдыт на патрэбы кіраўніцтва рэспублікі[328].

Аднак у тагачасных міжнародных рэаліях надзеі беларусаў былі дарэмныя. Пасля заключэння савецка-латвійскай мірнай дамовы згортванне структур БНР у Латвіі было пытаннем часу. Савецкі бок націскаў на ўлады ў Рызе, каб яны спынілі беларускую палітычную дзейнасць на тэрыторыі сваёй краіны. Беларускія дзеячы рыхтаваліся пакінуць краіну. Ужо 1 лістапада 1920 г. К. Езавітаў выслаў дыпламатычнаму прадстаўніцтву БНР у Коўна архіў ВДМ і бланкі пашпартоў[329]. На пачатку лістапада латвійскую сталіцу пакінулі В. Ластоўскі і А. Цвікевіч, якія вярнуліся ў Коўна. Міжнародная і ваенная сітуацыя ў рэгіёне схіляла ўлады БНР да шчыльнага супрацоўніцтва з Літвой. Пасля захопу Вільні ў кастрычніку 1920 г. войскамі ген. Люцыяна

---

[325] А. Каваленя, В. Даніловіч, В. Мазец, С. Тращцяк, *Беларуская народная рэспубліка – крок да незалежнасці: да 100-годдзя абвяшчэння: гістарычны нарысы*, Менск 2018, с. 123.

[326] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 924.

[327] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 928–938.

[328] ERA, f. 957, n. 11, s. 259, l. 37–48.

[329] К. Езавітаў, *Кароткі жыццяпіс і праходжаньне службы...*, с. 191; T. Błaszczak, *Białorusini w Republice Litewskiej 1918–1940*, Białystok 2017, s. 205.

Жалігоўскага літоўцы шукалі хаўруснікаў для барацьбы за Віленшчыну. У сувязі з гэтым 11 лістапада 1920 г. была падпісана літоўска-беларуская дамова. Згодна з ёй, Літва, узамен за ўдзел беларусаў у антыпольскіх акцыях, прадставіла ўраду БНР сваю тэрыторыю для дзейнасці, выдала грашовую дапамогу і абавязалася падтрымліваць беларускі ўрад на міжнароднай арэне. У новых палітычных рэаліях прадстаўніцтвы БНР у Латвіі планавалася перанесці ў Літву. Напрыканцы студзеня 1921 г. В. Захарка сустрэўся з Я. Чакстэ, каб абмеркаваць далейшы лёс беларускіх дыпламатычных і консульскіх структур у Рызе. Беларускі палітык пачуў адказ, што гэтыя ўстановы мусяць быць ліквідаваныя. У лісце В. Ластоўскаму (21 студзеня 1921 г.) К. Езавітаў інфармаваў: "*Сённека выяснілася, што Місію ўсё ж такі трэба ліквідаваць, бо, як я і раней ведаў і казаў, – нажымаюць ад Hotel'я Бельвью. Афіцыйных нотаў усходнікі не пасылалі, але некалькі разоў ужо прыватна ставілі пад увагу парушэнне дагавору латышамі, 'трымаючымі ў сябе прадстаўніцтва Ураду, змагаючагася з Усходам'. Я зраблю захады перад літвінамі і латышамі, каб перадаць нашых грамадзян літоўскаму пасольству. Латышы на гэта згадзіліся, а літоўскі пасол запрашывае згоды Літоўскага Ураду. Трэба Вам пагутарыць з Пурыцкім*[330]*, каб ён даў сюды належнае распараджэнне (...) Вельмі прашу Вас зрабіць націск на Пурыцкага, каб літвіны срочна ўзялі на сябе абарону нашых грамадзян*"[331]. Такім чынам, каб забяспечыць консульскую дапамогу грамадзянам, зарэгістраваным у консульстве БНР у Рызе, кіраўнік ВДМ парупіўся перадаць іх у юрысдыкцыю Літвы. Тым часам сам К. Езавітаў працягваў знаходзіцца ў Рызе ды спаўняць функцыі кіраўніка ВДМ, хоць установа знаходзілася ў стане ліквідацыі[332]. На пачатку снежня 1920 г. прэм'ер БНР упаўнаважыў яго разглядаць заявы пра выхад з беларускага грамадзянства. Кіраўнік ВДМ павінен быў весці ўлік асоб і штомесяц рыхтаваць справаздачы пра сваю працу[333].

У выніку ціску ўрада РСФСР 1 лютага 1921 г. латвійскія ўлады цалкам спынілі дзейнасць Вайскова-дыпламатычнай місіі БНР. 2 лютага 1921 г. К. Езавітаў

---

[330] Маецца на ўвазе Юозас Пурыцкіс (*Juozas Purickis*), кіраўнік літоўскага МЗС.

[331] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1018–1019.

[332] Далейшы лёс К. Езавітава спачатку быў няпэўны. Першапачаткова было вырашана, што пасля ліквідацыі ВДМ ён павінен выехаць у Коўна разам з архівам, грашыма і маркамі. Аднак пазней А. Вальковіч паінфармаваў, што ён мусіць застацца ў латвійскай сталіцы. У сувязі з гэтым К. Езавітаў прасіў урадавых інструкцый наконт далейшых крокаў: ці павінен ён застацца ў Рызе, ці выехаць (АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1019). У лісце кіраўніка ВДМ В. Ластоўскаму (30 студзеня 1921 г.) чытаем: "*будзьце ласкавы зараз жа пратэлефанаваць мне ў Рыгу як мне ехаць ці з усім маім багажом, ці 'налегке': гэта, канечне, залежыт ад таго, куды вы мяне збіраецеся ўпхнуць*" (АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1027). У рэшце рэшт В. Ластоўскі вырашыў пакінуць К. Езавітава ў Латвіі.

[333] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 59, л. 273.

пісаў В. Ластоўскаму, што разлічыўся з супрацоўнікамі місіі за студзень, а некаторыя атрымалі нават грошы за люты. Кіраўнік ВДМ застаўся зусім без грошай і прасіў прэм'ера выплаціць яму належныя за працу 17 400 нямецкіх марак. Акрамя таго, дзеяч прасіў згоды на паездку ў Эстонію, каб перадаць тамтэйшую беларускую калонію пад апеку літоўскай консульскай службы[334]. Такім чынам, пасля ліквідацыі ВДМ і беларускага консульства на пачатку 1921 г., функцыі апошняга выконвала консульская служба Літвы, паколькі ў складзе ўрада гэтай краіны існавала Міністэрства беларускіх спраў. У яго падпарадкаванні быў створаны беларускі консульскі аддзел (з сядзібай у Рызе) пры Літоўскім дыпламатычным прадстаўніцтве ў Латвіі, якім кіраваў У. Грунтоў[335]. З гэтага часу ўся афіцыйная дакументацыя кіравалася ў гэтую ўстанову, на бланках якой быў надпіс "Літоўскае Прадстаўніцтва ў Латвіі. Консульскі аддзел". У архіве консульства БНР у Рызе захоўваюцца дакументы гэтага аддзела, датаваныя канцом 1921 г.[336]

Падсумоўваючы, належыць адзначыць, што вайскова-палітычная чыннасць БНР у Латвіі ў 1919–1921 гг. з'яўляецца цікавай старонкай у гісторыі як Беларускай Народнай Рэспублікі, так і беларускай дыяспары на латвійскай зямлі. Дзейнасць структур БНР у гэтай краіне мела на мэце пошук шляхоў ажыццяўлення ідэі незалежнасці Беларусі. Вайскова-дыпламатычная місія ў Балтыі належала да самых актыўных замежных прадстаўніцтваў БНР. Праца гэтай установы давала плён: у Латвіі і суседніх краінах (Эстоніі і Фінляндыі) былі адчыненыя дыпламатычныя прадстаўніцтвы, якія давалі рэальную консульскую дапамогу тысячам людзей; дзеля ўплыву на грамадскую думку Латвіі і суседніх краін вялася агітацыйная кампанія, прысвечаная Беларусі; адбыліся першыя спробы наладзіць нацыянальна-культурнае жыццё ў Латвіі. Да няўдач мясцовай беларускай дзейнасці належыць залічыць спробы стварэння беларускіх вайсковых адзінак у складзе латвійскай арміі, беспаспяховыя латвійска-беларускія перамовы адносна дзяржаўнай мяжы. Не мелі поспеху і спробы ВДМ пераканаць заходніх хаўруснікаў палітычна, дыпламатычна, матэрыяльна і вайскова падтрымаць ідэю змагання за незалежнасць Беларусі.

---

[334] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1029.

[335] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1151.

[336] НАРБ, ф. 864, воп. 1, спр. 73.

РАЗДЗЕЛ II

Ад уздыму да заняпаду. Першы этап беларускай нацыянальна-культурнай аўтаноміі ў Латвіі (1921–1925)

Беларусы ў Латвійскай Рэспубліцы: статыстыка, размяшчэнне, дэмаграфічная і сацыяльна-эканамічная характарыстыка

Заканчэнне баявых дзеянняў у 1920 г. завяршыла працэс фарміравання дзяржаўных межаў Латвійскай Рэспублікі. 15 ліпеня 1920 г. Латвія падпісала мірнае пагадненне з Нямеччынай, а 11 жніўня 1920 г. – з РСФСР. Тэрыторыя латвійскай дзяржавы ахоплівала абшар, на якім апрача латышоў жыла значная частка прадстаўнікоў нятытульнай нацыі. Да апошніх належалі беларусы. Каб зразумець іх месца ў латвійскім грамадстве, неабходна прааналізаваць нацыянальную сітуацыю тагачаснай Латвіі. Асноўнай крыніцай, якая дазваляе прасачыць нацыянальны склад латвійскай дзяржавы і яго змены цягам міжваеннага часу, з'яўляюцца вынікі ўселатвійскіх перапісаў насельніцтва. Яны праводзіліся ў незалежнай Латвіі кожныя пяць гадоў: у 1920, 1925, 1930 і 1935 гг. Дадзеная табліца адлюстроўвае звесткі пра колькасць жыхароў Латвійскай Рэспублікі паводле нацыянальнай прыналежнасці.

Прааналізаваўшы статыстычныя звесткі, можна сцвердзіць, што латышы складалі больш як 70% насельніцтва, а кожны чацвёрты жыхар міжваеннай латвійскай дзяржавы належаў да нацыянальных меншасцей. Самымі шматлікімі нацыянальнымі групамі былі: рускія, габрэі, немцы, палякі, беларусы, літоўцы і эстонцы. Звяртае на сябе ўвагу тэндэнцыя выяўнага колькаснага спаду беларусаў. За пятнаццаць гадоў колькасць прадстаўнікоў беларускай меншасці ў афіцыйных статыстыках паменшылася ад 75 630 (4,74%) да 26 867 (1,38%). Асабліва звяртае на сябе ўвагу розніца ў звестках двух першых перапісаў, калі колькасць беларусаў скарацілася ажно на 37 620 чал.

Табліца 5. Нацыянальны склад Латвійскай Рэспублікі ў святле вынікаў уселатвійскіх перапісаў насельніцтва ў 1920, 1925, 1930 і 1935 гг.

Нацыянальнасць	1920	1925	1930	1935
Латышы	1 161 404 (72,76%)	1 354 126 (73,40%)	1 394 957 (73,42%)	1 472 612 (75,50%)
Рускія	124 746 (7,82%)	193 648 (10,50%)	201 778 (10,62%)	206 499 (10,59%)
Габрэі	79 644 (4,99%)	95 675 (5,19%)	94 388 (4,97%)	93 479 (4,79%)
Немцы	58 113 (3,64%)	70 964 (3,85%)	69 855 (3,68%)	62 144 (3,19%)
Палякі	54 567 (3,42%)	51 143 (2,77%)	59 374 (3,12%)	48 949 (2,51%)
Беларусы	75 630 (4,74%)	38 010 (2,06%)	36 029 (1,90%)	26 867 (1,38%)
Літоўцы	25 588 (1,60%)	23 192 (1,26%)	25 885 (1,36%)	22 913 (1,17%)
Эстонцы	8 769 (0,55%)	7 893 (0,43%)	7 708 (0,40%)	7 014 (0,36%)
Іншыя	7 670 (0,48%)	10 154 (0,54%)	10 025 (0,53%)	10 025 (0,51%)
Разам	1 596 131	1 844 805	1 899 999	1 950 502

Крыніца: M. Skujenieks, *Latvijas statistikas atlass*, Rīga 1938, s. 13.

Заўважным было і змяншэнне паміж перапісамі насельніцтва ў 1930 і 1935 гг., калі адмоўны баланс склаў 9 162 чал.[1] У шэрагу мясцовасцей беларусы ператварыліся з дамінантнай групы ў меншасць. Напрыклад, у некаторых вёсках Пустынскай воласці Лудзенскага павета працэнт беларусаў зменшылася з 90% (у 1920 г.) да 40% (у 1930 г.). Пэўныя ваганні ў лічбах былі ўласцівыя і іншым нацыянальным меншасцям (палякам, немцам, габрэям, літоўцам, эстонцам), але такія значныя статыстычныя змены адбываліся толькі сярод беларусаў. Чым дадзеную з'яву можна патлумачыць? Гэта не адбывалася пад уплывам масавай міграцыі або высокай смяротнасці. Змяншэнне лічбы беларусаў ішло разам з павелічэннем колькасці латышоў, рускіх і часткова палякаў. Гэта значыць, што многія з тых, хто яшчэ на пачатку 1920-х гг. фігураваў як беларус, у наступныя гады змяніў нацыянальнасць на іншую: у 1925 г. – на латышскую і рускую, у 1930 і 1935 гг. – на латышскую.

Сучаснікі па-рознаму ацэньвалі прычыны памяншэння беларускай меншасці. Дзеячы беларускага руху ў Латвіі і па-за яе межамі лічылі гэта вынікам

[1] M. Skujenieks, *Latvijas statistikas atlass*, Rīga 1938, s. 14.

адміністрацыйнага ціску і маніпуляцыі з боку дзяржавы. Памяншэнне колькасці тых, хто раней залічваў сябе да беларусаў, яны тлумачылі "латвійскай шавіністычнай палітыкай"[2]. Вось якім чынам вынікі перапісу 1930 г. каментавала віленская "Беларуская крыніца": "*Беларускае жыхарства беднае, цёмнае, пражываючае галоўным чынам у пагранічнай паласе, гдзе асабліва востра адчуваецца вайсковае становішча, задаволіла жаданні перапісчыкаў, у выніку чаго паўстаў перапіс – далёкі ад навуковай точнасці. На падставе вышэйсказанага, трэба сцвердзіць, што апошні перапіс не толькі не папраўіў ранейшае становішча адносна ліку Беларусаў, але яшчэ яго пагоршыў: пытанне аб правільным ліку беларусаў у Латвіі, такім чынам, і дагэтуль застаецца нявырашаным*"[3]. На думку некаторых беларускіх нацыянальных актывістаў, сапраўдная колькасць латвійскіх беларусаў складала не менш за 100–170 тыс.(!)[4]. Хутчэй за ўсё, згаданая лічба была атрыманая ў выніку залічэння да беларусаў большасці латгальскіх славянафонаў, незалежна ад іх нацыянальнай ідэнтычнасці. Дадзены падыход не належыць разглядаць як аб'ектыўны і навуковы.

У рэчаіснасці прычыны змяншэння колькасці беларусаў куды больш складаныя. Працэс асіміляцыі нацменаў быў непазбежны ва ўмовах існавання нацыянальнай дзяржавы з тытульнай нацыяй. У выпадку латвійскіх беларусаў асіміляцыя адбывалася хутчэй, чым у прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей, па прычыне такіх фактараў, як – нізкі ўзровень нацыянальнай свядомасці беларускамоўных аўтахтонаў Латгаліі; нешматлікасць мясцовай нацыянальнай інтэлігенцыі; адсутнасць моцнай матэрыяльнай базы беларускага руху ў Латвіі і за яе межамі; адсутнасць незалежнай беларускай дзяржавы. Маласвядомае ў нацыянальным сэнсе беларускамоўнае насельніцтва лёгка паддавалася на маніпуляцыі вонкавых сіл. У сувязі з гэтым перапісы насельніцтва можна лічыць пэўным тэстам на трывалась беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці ў Латвіі. Цягам усяго міжваеннага перыяду беларусамі паслядоўна запісвалася тая частка жыхароў, якая набыла беларускую самасвядомасць.

Падчас вызначэння нацыянальнасці ў апытальніку бралася над увагу як самаідэнтыфікацыя асобы, так і мова штодзённага ўжытку. Такім чынам, існавалі крытэрыі, якія маглі максімальна аб'ектыўна вызначыць нацыянальнасць. З іншага боку, перапісам займаліся камісары, якія прызначаліся

---

[2] Zadźwinski, *26 tysiač 867 biełarusaŭ u Łatwii*, "Беларуская крыніца", № 36 ад 6 кастрычніка 1933 г., с. 1.

[3] Бярознаўскі, *Да справы перапісу насельніцтва ў Латвіі*, "Беларуская крыніца", № 25 ад 9 чэрвеня 1930 г., с. 3.

[4] К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*..., с. 20; Я. Найдзюк, І. Касяк, *Беларусь учора й сяньня*, Менск 1993, с. 222.

амаль выключна з ліку латышоў. Яны не заўсёды разумелі мову нацменаў. У некаторых валасцях перапісчыкі не маглі адназначна вызначыць нацыянальнасць жыхароў, бо апошнія размаўлялі беларуска-польска-рускай моўнай мяшанкай. Падводзячы вынікі перапісу 1925 г., Латвійская статыстычная ўправа прызнавала, што найскладаней было правесці выразную мяжу паміж беларускім і рускім насельніцтвам. Чыноўнікі лічылі, што беларускае насельніцтва найлягчэй лакалізаваць на Прыдруйшчыне і ва ўсходняй частцы Дзвіншчыны (Ландскаронская, Пасіенская і Істэрская воласці), дзе яно кампактна пражывала. У іншых частках Латгаліі беларусы жылі ўперамежку з прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцей, перадусім рускімі, што стварала праблему з вызначэннем іх дакладнай колькасці. Пры гэтым аўтары выдання "Латвійскі перапіс насельніцтва 1925 г." меркавалі, што сапраўдная лічба беларусаў можа быць большая за тую, якую паказалі выніку перапісу[5].

Фактарам, які ўскладняў камісарам вызначэнне нацыянальнасці, быў значны адсотак непісьменных асоб з невыразнай ідэнтычнасцю. У залежнасці ад волі перапісчыкаў, "тутэйшае" сялянства магло быць беларускім, польскім, рускім ці латышскім. Параўнанне вынікаў чатырох перапісаў дазваляе зрабіць выснову, што суб'ектыўны фактар меў вырашальнае значэнне ў зменах афіцыйных статыстык адносна нацыянальнага аблічча шматэтнічных рэгіёнаў Латвіі. Гэтым належыць тлумачыць факт, што ў залежнасці ад палітычнай сітуацыі тыя самыя асобы дэкларавалі розную нацыянальнасць. Першы перапіс (1920 г.) адбыўся ў атмасферы ваеннага становішча і патрэбы нейтралізацыі мясцовага польскага і рускага рухаў (гл. раздзел IV). Таму ўлады ў Рызе намагаліся ў Латгаліі і Земгаліі завышаць колькасць беларусаў коштам палякаў і рускіх. Цікава, што нават беларускі бок часамі ўскосна прызнаваў, што ў 1920 г. у некаторых рэгіёнах латвійскія ўрадоўцы запісвалі беларусамі тых, хто не належыць да гэтай нацыянальнасці[6].

Падчас наступных перапісаў (1925, 1930) знікла неабходнасць актыўна падтрымліваць беларусаў. І хоць нельга сказаць, што ў пазнейшыя гады цалкам знікла тэндэнцыя латвійскіх улад да "фаварызацыі" беларусаў падчас перапісаў, іх вынікі былі больш аб'ектыўныя. Акрамя таго, у перыяд паміж перапісамі 1920 і 1930 гг. з'явіўся фактар, якога не было падчас першага перапісу: адбываўся працэс фарміравання нацыянальнай свядомасці беларускамоўных латгальцаў. Пад уплывам культурна-асветнай дзейнасці мясцовага беларускага руху частка мясцовых жыхароў трывала прыняла беларускую ідэнтычнасць. У сваю чаргу, перапіс 1935 г. цяжка лічыць аб'ектыўным, бо ён праводзіўся ва ўмовах аўтарытарнага ладу. Яго архітэктары не вагаліся

[5] *Otra tautas skaitišana Latvijā. 1925. gada 10. Februari*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1925, s. 67–68.

[6] Б. Зароўскі, *Ілукшчына чакае беларускай працы*, "Голас беларуса" 1926, № 27, с. 2.

выкарыстоўваць адміністрацыйныя сродкі, каб штучна павялічыць колькасць латышоў коштам прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей (гл. раздзел V).

У гэтым кантэксце заслугоўвае ўвагі меркаванне польскага даследчыка Януша Альбіна, які лічыць, што памяншэнне колькасці беларусаў у афіцыйных статыстыках належыць тлумачыць двума фактарамі. Па-першае, нізкім пачуццём нацыянальнай свядомасці беларускамоўных сялян, якія папаўнялі шэрагі латышоў і рускіх. Па-другое, адмовай з боку латвійскіх улад ад палітыкі аўтаматычнага запісвання беларускай нацыянальнасці ўсім латгальскім славянафонам. Таму даследчык лічыць, што колькасць беларусаў паводле перапісаў пасля 1920 г. больш адпавядае сапраўднасці[7]. Падобнага меркавання трымаецца Эрыкс Екабсонс, які сцвярджае, што найбольш аб'ектыўнымі былі вынікі перапісу ў 1930 г., калі ў Латвіі было налічана крыху больш як 36 тыс. беларусаў[8]. Зрэшты, вельмі падобнымі былі вынікі папярэдняга перапісу 1925 г. (звыш 38 тыс.), што дазваляе лічыць іх таксама блізкімі да праўды. Дакладнейшай методыкі, каб вызначыць колькасць беларусаў няма, таму з пэўнымі засцярогамі можна сцвярджаць, што ў міжваеннай Латвіі налічвалася іх 36–38 тыс. У сувязі з гэтым мы будзем карыстацца галоўным чынам вынікамі двух вышэйзгаданых перапісаў.

Табліца 6. Колькасць беларусаў у Латвіі ў падзеле на правінцыі і паветы паводле перапісаў насельніцтва ў 1925 і 1930 гг.

№	Назва латышская	Назва беларуская	Колькасць беларусаў у 1925 г.	%	Колькасць беларусаў у 1930 г.	%
I	Rīga	Рыга – горад	1 587	0,47	4 751	1,26
II	Vidzeme	Відзэмэ	266	0,07	1 848	0,46
1	Rīga	Рыга – акруга	93	0,10	629	0,59
2	Cesis	Кесь	42	0,07	233	0,38
3	Valmiera	Вальмера	17	0,24	204	0,02
4	Valka	Валка	12	0,02	365	0,46
5	Madona	Мадона	102	0,14	417	0,57
III	Kurzeme	Курляндыя	393	0,14	992	0,34
1	Liepāja	Ліепая	202	0,18	443	0,40
2	Aizpute	Айзпутэ	3	0,01	60	0,19
3	Kuldīga	Кульдыга	16	0,03	184	0,34

[7] J. Albin, *Polski ruch narodowy na Łotwie w latach 1919–1940*, Wrocław 1994, s. 12–13.

[8] Э. Екабсонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [в:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 47.

№	Назва латышская	Назва беларуская	Колькасць беларусаў у 1925 г.	%	Колькасць беларусаў у 1930 г.	%
4	Ventspils	Венспілс	18	0,04	101	0,20
5	Talsi	Талсі	154	0,30	204	0,49
IV	Zemgale	Земгалія	7 140	2,59	6 132	2,13
1	Tukums	Тукумс	39	0,10	238	0,55
2	Jelgava	Елгава	342	0,37	551	0,56
3	Bauska	Баўска	43	0,10	83	0,19
4	Jēkabpils	Екабпілс	669	1,49	291	0,62
5	Ilūkste	Ілукшта	6 047	11,69	4 969	9,06
V	Latgale	Латгалія	28 624	5,30	22 306	4,12
1	Daugavpils	Даўгаўпілс-горад	1 039	2,5	-	-
2	Krustpils	Крустпілс-горад	88	2,49	-	-
3	Kraslava	Краслава-горад	428	9,6	-	-
4	Daugavpils	Даўгаўпілс	17 582	10,73	13 544	8,38
5	Rēzeknes	Рэжыкнэ-горад	38	0,3	-	-
6	Rēzeknes	Рэжыкнэ	1 626	1,23	2 679	1,93
7	Ludza	Лудза-горад	64	1,15	-	-
8	Karsava	Карсава-горад	2	0,1	-	-
9	Ludza	Лудза	9 392	11,29	4 786	5,62
10	Jaunlatgale	Нова-Латгалія	24	0,02	1 297	1,25
Разам			38 010	2,06	36 029	1,90

Крыніца: *Otra tautas skaitišana Latvijā. 1925. gadā 10. Februari,* M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1925; *Treša tautas skaitišana Latvijā 1930. gadā,* M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1930, s. 70, 72, 77, 120–121.

З аналізу вынікаў перапісаў бачна, што ў двух правінцыях (Відзэмэ і Курляндыі) прадстаўнікі беларускай нацыянальнасці складалі нязначны адсотак. Асноўным месцам пражывання беларускай меншасці была Латгалія, якая складалася з чатырох паветаў (*apriņķis*). Гэтая правінцыя вызначалася этнічнай стракатасцю. Тут латышы (разам з латгальцамі) складалі толькі каля 60% насельніцтва (у 1930 г. – 56,9%). Беларусы з'яўляліся групай, заўважнай на латгальскім шматэтнічным краявідзе. Згодна з перапісамі 1925 і 1930 гг., у Латгаліі пражывала адпаведна 28 624 і 22 306 беларусаў. Гэта складала больш як 60% ад агульнай колькасці беларусаў у Латвіі[9].

[9] Э. Екабсонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [в:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 47.

Калі казаць пра месцы кампактнага пражывання латгальскіх беларусаў, дык у першую чаргу гаворка ідзе пра два паўднёвыя паветы – Даўгаўпілскі і Лудзенскі, дзе ў 1925 і 1930 гг. іх лічба вагалася ў межах 8,38–10,73% і 5,62–11,29% ад агульнай колькасці насельніцтва. У меншай ступені гэта тычыцца Рэжыцкага і Нова-Латгальскага паветаў.

Варта ўважлівей прааналізаваць колькасць асоб беларускай нацыянальнасці ў гэтых рэгіёнах. У 1920 г. беларусаў у межах Даўгаўпілшчыны было 18 470 (10,7%), Лудзеншчыны – 25 659 (18%), Рэжыччыны – 13 355 (9,8%). Разам у Латгаліі тады налічылі ажно 57 484 беларусаў (11,8% насельніцтва правінцыі). Беларусы складалі большасць у дзевяці валасцях: Прыдруйскай (86,1%) і Пустынскай (63,4%) Даўгаўпілскага павету; Істэрскай (93,4%%), Янавольскай (66,2%), Пасіенскай (81,6%), Рунданскай (52%) і Толкаўскай (77,3%) Лудзенскага павету[10]. Нягледзячы на недасканаласці перапісу 1920 г., усё ж гэтыя лічбы сведчаць, што Латгалія была самай "беларускай" правінцыяй Латвіі. І гэта яскрава пацвердзілі вынікі наступных перапісаў. Табліцы ўтрымліваюць статыстыку колькасці беларусаў на Лудзеншчыне і Даўгаўпілшчыне ў 1925 і 1930 гг.

Табліца 7. Колькасць беларусаў у Лудзенскім павеце ў падзеле на воласці ў 1925 і 1930 гг.

Латышская назва валаснога цэнтра і воласці	Беларуская назва валаснога цэнтра і воласці	1925	%	1930	%
Ludza	Лудза	64	1,1	98	1,8
Kārsava	Карсава	2	0,1	23	1,24
Разам у гарадах		66	0,07	121	1,68
Brigi, Janovales/Brigu pagasts	Брыгі, Янавольская/Брыгаўская	5	0,1	55	1,14
Cibla, Eversmuižas/Ciblas pagasts	Цыбла, Эверсмуйжская/ Цыблаўская	3	0	111	1,7
Kārsava, Kārsavas pagasts	Корсаўка, Корскаўская	0	0	10	0,1
Mērdzene, Michalovas/Mērdzenes pagasts	Мердзене, Міхайлаўская/ Мердзенская	71	0,6	143	1,3
Nirza, Nirzas pagasts	Нірза, Нірдзенская	6	0,1	165	3
Pasiene, Pasienes pagasts	Пасіене, Пасіенская	4 060	43,8	2 816	33,4
Pilda, Pildas pagasts	Пылда, Пылдзенская	27	0,3	52	0,7
Rogovka, Zalmuižas/Nautrēnu pagasts	Рагоўка, Зальмуйжская/ Наўтрэнская	0	0	48	0,79
Rundēni, Rundēnu pagasts	Рунданы, Рунданская	396	10,3	232	6

[10] Для параўнання варта дадаць, што ў іншых правінцыях Латвіі колькасць беларусаў складала: у Відзэмэ – 3 136 (у тым ліку ў Рызе – 2 524), у Курляндыі – 700, у Земгаліі – 4 813. LVVA, 2125 f., 5 ap., 258 l., 68 lp.; *Latvijas statistikas gada grāmata 1921*, Rīga 1922, s. 4.

Латышская назва валаснога цэнтра і воласці	Беларуская назва валаснога цэнтра і воласці	1925	%	1930	%
Šķaune, Lanskoronas/Šķaunes pagasts	Шкяўне, Ландскаронская/ Шкяўненская	939	14,2	424	6,39
Vecslabada, Istras pagasts	Старая Слабада, Істэрская/ Стараслабодская	3 411	54	258	3,2
Zvirgzdene, Zvirgzdenes pagasts	Звіргздэнэ, Звіргздэнская	408	7,4	351	5,8
Разам у валасцях		9 326	11,2	4 665	5,6
Разам у павеце		9 392	10,4	4 786	5,3

Крыніца: *Otra tautas skaitišana Latvijā. 1925. gada 10. Februari,* M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1925; *Treša tautas skaitišana Latvijā 1930. gadā*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1930, s. 133.

Такім чынам, вялікім працэнтам беларускага насельніцтва ў Лудзенскім павеце вызначаліся дзве воласці: Пасіенская і Істэрская. Варта, аднак, дадаць, што ў апошняй у 1930 г. адбылося істотнае памяншэнне лічбы беларусаў у параўнанні з папярэднім перапісам. Заўважная колькасць беларусаў жыла ў Звіргздэнскай, Шкяўненскай, Рунданскай, Нірдзенскай, Мердзенскай і Цыблаўскай валасцях. У астатніх лічба была нязначная. Агульная колькасць беларусаў у павеце вагалася паміж 4 786 (5,3%) і 9 392 (10,4%).

Табліца 8. Колькасць беларусаў у Даўгаўпілскім павеце ў падзеле на воласці ў 1925 і 1930 г.

Назва валаснога цэнтра і воласці	1925	%	1930	%
Daugavpils – Даўгаўпілс	1 039	2,5	1 006	2,3
Krustpils – Круспілс	88	2,5	58	1,8
Krāslava – Краслава	428	9,6	177	4,1
Līvāni – Лівенгоф	0	0	1	0
Preiļi – Прэлі	1	0	12	0,7
Viški – Вішкі	1	0	-	-
Разам у гарадах	1 557	2,8	1 254	2,2
Aiviekste, Aiviekstes pagasts – Айвіекстэ, Айвіекская	70	2,4	59	3,7
Asūne, Asūnes pagasts – Асунь, Асунская	199	2,9	112	1,7
Grāveri /Auleja, Grāveru/Aulejas pagasts – Граверы/Аўлея, Граверская/Аўлеўская	987	15,3	1 134	17,7
Dagda, Dagdas pagasts – Дагда, Дагдзеская	108	1,5	69	1,0
Izvalta, Izvalta pagasts – Ізвалта, Ізвалцкая	45	0,7	176	2,0
Jasmuiža, Jasmujžas pagasts – Ясмуйжа, Ясмуйжская	4	0	4	0,1
Kalupe, Kalupes pagasts – Калуп, Калупская	1	0	3	0,1
Geraņimova, Kapiņu pagasts – Геранімава, Капінская	1 128	9	1 284	10,6
Krāslava, Krāslavas pagasts – Краслава, Краслаўская	1 003	13,3	406	5,6

Назва валаснога цэнтра і воласці	1925	%	1930	%
Krustpils, Krustpils pagasts – Круспілс, Круспіская	1	0	74	1,2
Līksna, Līksnas pagasts – Ліксна, Лікснeнская	4	0	60	0,6
Līvāni, Līvānu pagasts – Лівенгоф, Лівенская	0	0	10	0,1
Naujene, Naujnes/Maļinovas pagasts – Юзафова, Наўенская/Малінаўская	282	2,2	109	1,3
Piedruja, Piedrujas pagasts – Прыдруйск, Прыдруйская	6 042	91,6	4 354	68,2
Preiļi, Preiļu pagasts – Прэле, Прэльская	0	0	34	0,4
Pustiņa, Pustiņas pagasts – Пустын, Пустынская/ Рабежніцкая	2 069	52,5	2 013	51,4
Rudzāti, Rudzētu pagasts – Рудзяны, Рудзянская	0	0	3	0,1
Skaista, Skaistas/Izabelinas pagasts – Скайсты, Скайсценская/Ізабэлінская	3 303	48,5	1 854	27,5
Ungurmuiža, Ungurmuižas pagasts – Унгурмуйжа, Унгумруйжская	56	1,45	380	11,4
Vārkava, Vārkavas pagasts – Варкава, Варкоўская	6	0	1	0,0
Vīpe, Vīpes/Mežmuižas pagasts – Выпес/Мэжвіды, Выпенская/Мэжвідская	0	0	3	0,2
Višķi, Višķu pagasts – Вышкі, Вышкаўская	717	9,1	148	1,4
Разам у валасцях	16 025	10,7	12 290	8,4
Разам у павеце	17 582	8,6	13 544	6,7

Крыніца: *Otra tautas skaitišana Latvijā. 1925. gada 10. Februari,* M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1925; *Treša tautas skaitišana Latvijā 1930. gadā*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1930, s. 132.

З аналізу пададзеных вышэй звестак вынікае, што на Даўгаўпілшчыне найбольш "беларускімі" былі воласці: Прыдруйская, Пустынская і Скайсценская. Значны адсотак беларусы складалі ў Аўлаўскай, Капінскай, Краслаўскай, Малінаўскай, Асунскай, Ізвалцкай і Унгурмуйжскай валасцях. У астатніх лічба была нязначнай. Беларусы ў Даўгаўпілскім павеце складалі ад 13 544 (6,7%) да 17 582 (8,6%).

Статыстыка даводзіць, што ў двух астатніх паветах Латгаліі – Рэжыцкім і Нова-Латгальскім – колькасць беларусаў была значна меншай. На Рэжыччыне іх лічба ў 1925 і 1930 гг. была адпаведна 1,6 тыс і 2,7 тыс. Значная колькасць беларусаў у гэтым павеце, была зафіксаваная толькі ў часе перапісу 1920 г. Тады перапісныя камісары налічылі тут ажно 13 355 беларусаў (9,8% насельніцтва), у тым ліку ў Ружынскай воласці (*Ružinas pagasts*) – 4 098 (66,1%), у Букмуйжайскай (Вайводаўскай) (*Bukmuižas pagasts*) – 1 884 (31%), у Разенмуйжскай (*Rozenmuižas pagasts*) – 1 599 (17,3%), у Макашанскай (*Makašēnu pagasts*) – 1 541 (20%), у Каўнацкай – (*Kaunatas pagasts*) 1 135 (13,4%)[11].

[11] LVVA, 2125 f., 5 ap., 258 l., 68 lp.

Аднак, беручы пад увагу недасканаласць перапісу, а таксама факт, што ўжо праз пяць гадоў колькасць беларусаў на Рэжыччыне ў дзяржаўных статыстыках паменшылася да 1 626 чал., належыць паставіць пад сумнеў такую значную колькасць беларусаў на тэрыторыі павета. Толькі ў адной воласці – Букмуйжайскай – колькасць беларусаў у 1920 г. і 1925 г. амаль не змянілася (у 1925 г. тут было налічана 1 186 беларусаў). Гэта дазваляе меркаваць, што толькі тут на Рэжыччыне беларуская свядомасць пусціла карані. Пэўная колькасць тых, хто ў 1925 г. дэкларавaў беларускую нацыянальнасць, пражывала на тэрыторыі Андрупенскай (*Andrupenes pagasts*) – 141 (1,5%), Каўнацкай (*Kaunatas pagasts*) – 67 (0,7%), Быкаўскай (*Bikavas pagasts*) – 55 (1,4%), Салуёнскай (*Silajaņu pagasts*) – 46 (0,49%) валасцях. У іншых валасцях лічба беларусаў вагалася ад 0 да 24[12]. Вынікі перапісу 1930 г. паказалі, што ў Букмуйжайскай воласці колькасць беларусаў узрасла да 1 589 чал. (24,3%). Да ліку іншых валасцей з пэўным адсоткам беларусаў належалі: Сакстыгальская (*Sakstīgalas pagasts*) – 122 (1,7%), Вілянская (*Vilānu pagasts*) – 104 (1,2%), Бержгальская (*Bērzgales pagasts*) – 82 (1,1%) і Каўнацкая – 81 (0,8%). У астатніх валасцях Рыжыччыны гэта лічба не перавышала 31[13].

Найменшая колькасць асоб беларускай нацыянальнасці адзначалася ў Нова-Латгальскім павеце з цэнтрам у мясцовасці Абрэнэ (латыш.: *Jaunlatgale* (1925–1938), пазней *Abrene* (1938–1945)). Гэта тэрытарыяльна-адміністратыўная адзінка з'явілася пасля далучэння да Латвіі ў 1920 г. заходняй часткі Астроўскага павета Пскоўскай губерні. Спачатку Абрэнаўшчына існавала ў межах Лудзеншчыны, але ў 1925 г. стала самастойным паветам. Згодна з перапісам 1930 г., у гэтым павеце пражывала 1 297 беларусаў (1,24% насельніцтва). Большасць складалі жыхары Балвускай (*Balvu pagasts*) (885 чал.) і Ругайскай (*Rugāju pagasts*) (132 чал.) валасцей[14].

Другой па колькасці беларусаў – пасля Латгаліі – правінцыяй была Земгалія. У 1925 г. у гэтым рэгіёне налічвалася іх 7 140 (2,58% агульнай лічбы жыхароў), а ў 1930 г. – 6 132 тыс. (2,13%). Найбольш беларусаў жыло ў Ілукштанскім павеце, дзе ў 1925 г. яны складалі 6 047 (11,69%), а ў 1930 г. – 4 969 тыс. (9,06%)[15].

Згодна з вынікамі перапісаў у 1925 і 1930 гг., да ліку валасцей, дзе асобы беларускай нацыянальнасці складалі значны адсотак, належылі: Каплаўская (Борнская), Бароўская (пазней Сіленская), Дземанская, Саліенская

---

[12] *Otra tautas skaitišana Latvijā. 1925. gada 10. Februari*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1925.

[13] *Treša tautas skaitišana Latvijā 1930. gadā*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1930, s. 133.

[14] *Treša tautas skaitišana Latvijā 1930. gadā*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1930, s. 133–134.

[15] Цікава, што паводле перапісу 1920 г. у Ілукштанскім павеце было налічана 4 447 беларусаў. *Latvijas statistikas gada grāmata 1921*, Rīga 1922, s. 4.

Табліца 9. Колькасць беларусаў у Ілукштанскім павеце ў падзеле на воласці ў 1925 і 1930 гг.

Назва валаснога цэнтру і воласці	1925	%	1930	%
Ilūkste – Ілукшта	20	2	14	1,16
Subata – Субата	2	0,1	2	0
Grīva – Грыва	50	1,89	364	6,8
Разам у гарадах	72	1,3	380	4,6
Aknīste, Aknīstes pagasts – Акніст, Акнінская	-	-	7	0,3
Asare, Asares pagasts – Асарэ, Асарская	0	0	21	1,9
Bebrene, Bebrenes pagasts – Бебранэ, Бебранская	1	0	1	0
Demene, Demenes pagasts – Дземанэ, Дземанская	984	39,3	763	31,01
Dviete, Dvietes pagasts – Двіетэ, Двіенценская	0	0	1	0
Gārsene, Gārsenes pagasts – Гарсенэ, Гарсенская	2	1,2	1	0,8
Kalkūni, Kalkūnes/Laucesas pagasts – Калкуны, Калкунская	351	6,49	218	5,3
Kaplava, Bornes/Kaplavas pagasts/ Каплава, Борненская/Каплаўская	1 229	52,6	718	31
Kurcums, Kurcuma pagasts – Хршчова, Курцумская	294	14,9	260	5,37
Šēdere, Lašu pagasts – Шэдэре, Ласенская	11	0,3	198	6,4
Pilskalne, Pilskalnes pagasts – Пілскалнэ, Пілсканская	184	8,8	89	4,2
Subate, Prodes pagasts – Субатэ, Продская	1	0	7	0,33
Rauda, Šēdere, Stelles/Raudas pagasts – Шэдарэ, Стэленская/Раўданская	6	0,8	112	12,43
Rubeņi, Rubenes pagasts – Рубені, Рубенская	1	0	2	0
Saliena, Salienas pagasts – Саліена, Саліенская	870	24,2	865	22,4
Borovka/Silene, Borovkas/Silenes pagasts – Бароўка/ Сілена, Бароўская/Сіленская	1 065	32,6	504	9,62
Skrudaliena, Skrudalienes pagasts – Скрудаліена, Скрундалінская	760	25,2	308	9,6
Susēja, Susējas pagasts – Сусея, Сусейская	0	0	4	0,3
Svente, Sventes pagasts – Свентэ, Свенцская	216	8,5	510	18,8
Разам у воласці	5 975	12,89	4 589	9,8
Разам у павеце	6 047	11,69	4 969	9

Крыніца: *Otra tautas skaitišana Latvijā. 1925. gada 10. Februari,* M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1925; *Treša tautas skaitišana Latvijā 1930. gadā*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1930, s. 131–132.

і Скрундалінская. Меншая, але заўважная, колькасць беларусаў назіралася ў Калкунскай, Курцумскай і Пілсканскай валасцях[16].

[16] LVVA, 2125 f., 5 ap., 258 l., 68 lp.

Падсумоўваючы, можна адзначыць, што месцам кампактнага пражывання латвійскіх беларусаў з'яўляліся чатыры латгальскія (Даўгаўпілскі, Лудзенскі і часткова Рэжыцкі і Нова-Латгальскі) і адзін земгальскі (Ілукштанскі) паветы. Згодна з перапісам насельніцтва 1925 г., у гэтым кутку жыло каля 90%, а ў 1930 г. – 75% усіх беларусаў Латвіі. Разам з тым, вынікі перапісаў 1925 і 1930 гг. паказваюць, што ў той перыяд колькасць беларусаў павольна памяншалася ў Латгаліі (на 6 318 чал.) і ў Земгаліі (на 1 008 чал.) і адначасова расла ў Рызе (на 3 164 чал.) і Відзэмэ (на 1 582 чал.)[17].

Паводле рэлігійнай прыкметы латвійскія беларусы належалі да розных веравызнанняў. Рэлігійная стракатасць адрознівала латвійскіх беларусаў ад іншых нацменаў, якім быў уласцівы больш аднародны склад. Напрыклад, у палякаў і літоўцаў дамінавала каталіцтва, у габрэяў – юдаізм, у рускіх – праваслаўе і стараверства. Больш падрабязны рэлігійны падзел беларускай супольнасці ў Латвіі дэманструе табліца.

Табліца 10. Колькасць беларусаў у Латвіі паводле веравызнання ў 1930 гг.

Правінцыі Паветы	Лютэране	Каталікі	Праваслаўныя	Стараверы	Іўдзеі	Іншыя
Рыга – горад	33	1 483	2 147	1 021	9	58
Відзэмэ	30	306	1 032	468	0	12
Рыга – павет	10	142	288	186	0	3
Кесь	3	59	117	54	0	0
Вальмера	5	43	115	39	0	2
Валка	8	15	269	73	0	0
Мадона	4	47	243	116	0	7
Курляндыя	10	134	599	235	0	14
Ліепая	1	53	301	78	0	10
Айзпутэ	1	14	30	15	0	0
Кулдыга	2	12	100	69	0	1
Венспілс	3	38	42	17	0	1
Талсэн	3	17	126	56	0	2
Земгалія	20	3 817	1 464	826	0	14
Тукумс	0	76	117	45	0	0
Елгава	13	117	295	124	0	2
Баўска	1	30	43	9	0	0

[17] *Treša tautas skaitišana Latvijā 1930. gadā*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1930, s. 88.

Правінцыі Паветы	Лютэране	Каталікі	Праваслаўныя	Стараверы	Іўдзеі	Іншыя
Екабпілс	4	45	114	127	0	11
Ілукшта	2	3 549	895	521	0	2
Латгалія	12	16 480	4 038	1 719	1	60
Даўгаўпілс	7	11 223	1 244	1 052	0	22
Рэжыкнэ	0	1 668	396	608	0	7
Лудза	0	3 569	1 172	43	1	1
Нова-Латгалія	5	20	1 226	16	0	30
Разам	105	22 220	9 280	4 269	11	158

Крыніца: *Treša tautas skaitišana Latvijā 1930. gadā*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1930, s. 194–207.

Статыстыка паказвае, што большасць латвійскіх беларусаў спавядала каталіцтва. У 1930 г. такіх налічвалася 22 280 чал. Другой па колькасці рэлігійнай групай былі праваслаўныя, якіх было 9 820 чал. Істотную частку складалі стараверы, у колькасці 4 269 чал. Нязначны быў працэнт вернікаў Лютэранскай царквы і прадстаўнікоў іншых веравызнанняў.

Неабходна ўважліва разгледзець тры найбольшыя рэлігійныя групы латвійскіх беларусаў. Аналіз вынікаў усіх чатырох міжваенных перапісаў насельніцтва Латвіі паказвае, што ад 62% да 75,5% мясцовых беларусаў была каталікамі. У агульнай статыстыцы яны складалі каля 5–6% вернікаў Каталіцкай царквы ў міжваеннай Латвіі і былі чацвёртай па колькасці нацыянальнай групай (пасля латышоў, палякаў і літоўцаў) сярод мясцовых каталікоў[18]. Гэта акалічнасць адрознівае латвійскіх беларусаў ад суродзічаў у іншых частках беларускага этнаграфічнага абшару, дзе сінонімам беларускасці з'яўлялася праваслаўе, а каталіцтва атаясамлівалася з прыналежнасцю да польскай нацыянальнасці. У адрозненне ад іншых славянска-балцкіх этнічных памежжаў (Віленшчыны), у Латгаліі лацінскі абрад быў маркерам як польскасці, так і іншых нацыянальнасцей, у тым ліку беларускасці[19]. На думку некаторых даследчыкаў, ментальна мясцовым каталікам-беларусам было бліжэй да латгальцаў, чым да латышоў-лютэранаў[20].

---

[18] M. Skujenieks, *Latvijas statistikas atlass*, Rīga 1938, s. 13.

[19] K. Zajas, *Nieobecna kultura. Przypadek Inflant Polskich*, Kraków 2008, s. 148; M. Jankowiak, *Gwary białoruskie na Łotwie w rejonie krasławskim: studium socjolingwistyczne*, Warszawa 2009, s. 57–58.

[20] Т. Кузнецова, *Белорусы в информационном пространстве Латвии 20–30-х годов XX века: М. Скуениекс "Латвия. Страна и жители" (M. Skujenieks "Latvija. Zeme un iedzīvotāji")*, "Латыши и белорусы: вместе сквозь века", Минск 2015, № 4, с. 39.

Табліца 11. Нацыянальны склад вернікаў Каталіцкай царквы ў Латвіі ў 1925, 1930 і 1935 гг.

Нацыянальнасць	1925	%	1930	%	1935	%
Латышы	308 591	74	337 401	74,9	388 118	81,37
Палякі	50 237	12	58 274	12,9	47 494	9,96
Беларусы	28 649	6,8	22 220	4,9	14 164	2,11
Літоўцы	22 439	5	24 915	5,5	21 952	4,60
Рускія	3 283	0,7	3 972	0,8	1 996	0,4.2
Іншыя	3 570	0,8	3 428	0,7	3 239	0,68
Разам	416 769	100	450 210	100	476 963	100

Крыніца: *Otra tautas skaitišana Latvijā. 1925. gada 10. Februari*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1925, s. 78; *Treša tautas skaitišana Latvijā 1930. gadā*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1930, s. 165; *Ceturta tautas skaitīšana Latvijā 1935 gada*, sastādijīs V. Salnītis un redigējis M. Skujenieks, Rīga 1936, s. 83.

Табліца 12. Нацыянальны склад вернікаў Каталіцкай царквы ў Латгаліі і на Ілукшчыне ў 1930 г.

Павет	Нацыянальнасць		
	Беларусы	Палякі	Латышы
Даўгаўпілскі	8,2%	13,9%	73,8%
Рэжыцкі	1,8%	5,7%	92%
Лудзенскі	5,9%	7,5%	83,2%
Нова-Латгальскі	0%	1,9%	97,5%
Ілукштанскі	11,5%	20,2%	57,2%
Разам	5,8%	10,4%	81,4%

Крыніца: W. Sworakowski, *Polacy na Łotwie. Uwagi o ich liczbie i rozmieszczeniu, składzie wyznaniowym, podziale według płci i wieku, analfabetyzmie i strukturze społeczno-gospodarczej na podstawie łotewskiego spisu ludności 1930 r.*, Warszawa 1934, s. 32.

Дадзеныя табліцы дазваляюць уявіць геаграфію пражывання каталікоў-беларусаў і іх працэнтную вагу ў параўнанні з каталікамі іншых нацыянальнасцей. Большасць беларускіх каталікоў у 1930 г. пражывала ў пяці паветах Латгаліі (16 480) і на Ілукшчыне (3 549). У 1930 г. да каталіцкага веравызнання належала: у Даўгаўпілскім павеце – 11 223 беларусаў, у Лудзенскім – 3 569, у Рэжыцкім – 1 668. Апроч таго, у 1930 г. у сталіцы Латвіі пражывала 1 483 беларусаў-каталікоў (на 41 586 каталікоў) і 142 – у Рыжскім павеце[21].

[21] *Treša tautas skaitišana Latvijā 1930. gadā*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1930, s. 195.

Што тычыцца праваслаўных беларусаў, дык яны былі трэцяй паводле колькасці нацыянальнай групай (пасля рускіх і латышоў) сярод вернікаў Праваслаўнай царквы ў Латвіі. У 1930 г. яны складалі 5,47% (9 280 чал.) ад агульнай колькасці мясцовых праваслаўных. Праўда, ужо праз пяць гадоў іх вага паменшылася да 4,8% (8 520 чал.). Такім чынам, адсотак праваслаўных сярод беларускай супольнасці ў Латвіі вагаўся паміж 27% і 32%[22].

Табліца 13. Нацыянальны склад вернікаў Праваслаўнай царквы ў Латвіі ў 1925, 1930 і 1935 гг.

Нацыянальнасць	**1925**	**%**	**1930**	**%**	**1935**	**%**
Рускія	103 838	61	104 791	61,78	103 438	59,31
Латышы	53 396	31	51 211	30,19	57 600	33
Беларусы	6 496	3	9 280	5,47	8 520	4,89
Эстонцы	1 441	0,5	1 264	0,74	1 139	0,65
Іншыя	2 367	1	3 079	1,82	3 692	2,12
Разам	167 538	100	169 625	100	174 389	100

Крыніца: *Otra tautas skaitišana Latvijā. 1925. gada 10. Februari,* M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1925, s. 80; *Treša tautas skaitišana Latvijā 1930. gadā*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1930, s. 167; *Ceturta tautas skaitīšana Latvijā 1935 gada,* sastādijis V. Salnītis un redigējis M. Skujenieks, Rīga 1936, s. 85.

Найбольш праваслаўных вернікаў жыло на Даўгаўпілшчыне – ў Прыдруйскай воласці; на Лудзеншчыне – ў Істэрскай, Брыгаўскай, Пасіенскай, Пілзенскай, Рунданскай і Махайлаўскай валасцях. У 1930 г. у Лудзенскім павеце было 1 172 праваслаўных беларусаў, у Даўгаўпілскім – 1 244, у Рэжыцкім – 396, у Нова-Латгальскім – 1 226. На Ілукшчыне беларусамі запісаліся 895 праваслаўных. Апрача таго, у Рызе ў 1930 г. жыло 2 147 праваслаўных беларусаў (на 32 802 праваслаўных вернікаў Рыгі) і 288 – у Рыжскім павеце[23].

Згодна з вынікамі перапісу 1925 г., у Латвіі налічвалася 2 723 (3%) стараверaў, якія запісаліся беларусамі. Стараверы-беларусы былі другімі па колькасці (пасля рускіх)[24]. Іх лічба складала 11% ад агульнай колькасці латвійскіх беларусаў[25]. У 1930 г. прыналежнасць да беларускаскай нацыянальнасці

[22] M. Skujenieks, *Latvijas statistikas atlass*, Rīga 1938, s. 12.

[23] *Treša tautas skaitišana Latvijā 1930. gadā*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1930, s. 195, 202–205.

[24] *Otra tautas skaitišana Latvijā. 1925. gada 10. Februari*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1925, s. 80.

[25] Э. Екабсонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [в:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 47.

дэкларавала 4 269 (4,41%) стараверaў. Большасць з іх пражывала ў Латгаліі (1 719) і на Рэжыччыне (608), а таксама ў Рызе (1 021) і ў Рыжскім павеце (186)[26].

Табліца 14. Нацыянальны склад стараверaў у Латвіі ў 1925, 1930 і 1935 гг.

Нацыянальнасць	1925	%	1930	%	1935	%
Рускія	85 120	95,39	91 092	94,10	99 810	93,11
Беларусы	2 723	3,05	4 269	4,41	4 037	3,77
Латышы	1 222	1,37	972	1	2 786	2
Іншыя	174	0,19	469	0,40	562	0,52
Разам	89 239	100	96 802	100	107 195	100

Крыніца: *Treša tautas skaitišana Latvijā 1930. gadā*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1930, s. 168; *Ceturta tautas skaitīšana Latvijā 1935 gada*, sastādijīs V. Salnītis un redigējis M. Skujenieks, Rīga 1936, s. 87.

Паводле сацыяльнага статусу латгальскія беларусы пераважна былі жыхарамі вёскі. У 1925 г. у вёсках пражывала 33 635 прадстаўнікоў беларускай меншасці (2,78% вясковага насельніцтва Латвіі). Вясковае насельніцтва складала больш як 88% тагачаснай беларускай супольнасці ў латвійскай дзяржаве. У сельскай гаспадарцы працавала 20 331 беларусаў[27]. Праз пяць гадоў сяляне па-ранейшаму складалі большасць латвійскіх беларусаў. У 1930 г. беларусаў-вяскоўцаў было 28 262 (2,34% латвійскага сялянства)[28]. Сярод дарослых асоб беларускай нацыянальнасці 20 720 складалі жыхары вёсак і толькі 1 586 – гарадоў[29].

Асноўную колькасць вясковых беларусаў складалі сяляне. У 1935 г. на 12 686 чынных прафесійна вясковых беларусаў ажно 12 121 былі сялянамі, толькі 362 прамысловымі работнікамі і 54 хатнімі служкамі[30]. Лічба асоб беларускай нацыянальнасці, якія працавалі ў сельскай гаспадарцы Латвіі, складала 12 499 (11 836 гаспадароў сялянскіх гаспадарак, 572 работнікаў лясной гаспадаркі, 80 садаводаў, 11 рыбакоў). Большасць складалі жыхары Латгаліі (7 724) і Земгаліі (2 606)[31].

---

[26] *Treša tautas skaitišana Latvijā 1930. gadā*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1930, s. 168.

[27] *Otra tautas skaitišana Latvijā. V. Nodarbošanās*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1928, s. 526.

[28] *Treša tautas skaitišana Latvijā 1930. gadā*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1930, s. 73–74.

[29] *Treša tautas skaitišana Latvijā 1930. gadā*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1930, s. 134.

[30] *Ceturta tautas skaitīšana Latvijā 1935 gada*, sastādijīs V. Salnītis un redigējis M. Skujenieks, Rīga 1936, s. 472.

[31] *Ceturta tautas skaitīšana Latvijā 1935 gada*, sastādijīs V. Salnītis un redigējis M. Skujenieks, Rīga 1936, s. 498, 538.

Характэрнай рысай беларускай сялянскай супольнасці Латвіі была адсутнасць заможнага элементу. У асноўным гэта былі ўласнікі невялікіх зямельных надзелаў, якія з цяжкасцю забяспечвалі свае сем'і. У значнай ступені гэта было абумоўлена тым, што Латгалія была самай адсталай у сацыяльна-эканамічным сэнсе часткай латвійскай дзяржавы. Асаблівасцю латгальскай вёскі было тое, што яна пакутавала на зямельны голад. Пасля скасавання прыгоннага права ў 1861 г. сярэднестатыстычная сялянская гаспадарка мела 2,2–5,5 га зямлі. Гэты надзел з году ў год змяншаўся ў сувязі з ростам насельніцтва. Гаспадаркі меншалі і не маглі забяспечыць належны ўзровень жыцця[32]. Правінцыя была перанаселеная. У 1925 г. у Латгаліі пражывала 539 682 чал. (34,4% насельніцтва Латвіі). Для параўнання: у Відзэмэ жыло 404 834 чал., у Курляндыі – 286 650 чал., у Земгаліі – 275 940 чал.[33] Паводле стану на 1926 г., у Латгаліі на квадратны кіламетр прыпадала амаль 35 жыхароў. У іншых правінцыях гэтыя звесткі выглядалі наступным чынам: у Відзэмэ – 17,6, у Курляндыі – 21,4, у Земгаліі – 20,3. Пераважная большасць жыхароў правінцыі складала вясковае насельніцтва, якога ў сярэдзіне 1920-х гг. было каля 85%. З кожным годам пад уплывам значнага натуральнага прыросту на вёсцы рабілася ўсё "цясней". Нешматлікія латгальскія гарады (Даўгаўпілс, Лудза, Краслава і інш.) не мелі буйной прамысловасці, таму не маглі паглынуць "лішкі" вясковага насельніцтва ў той ступені, якая дазволіла б ліквідаваць перанаселенасць. У выніку на вёсцы панавала беспрацоўе і беззямелле. Кастусь Езавітаў у кароткіх, але трапных словах ахарактарызаваў дэмаграфічнае становішча латгальскай правінцыі: "*Латгалія з'яўляецца нейкай вялізарнейшай вёскай. Народу ў гарадох жыве мала, а воласці вельмі вялікія па абшару і па лічбе жыхарства*"[34].

Да пагаршэння матэрыяльнага становішча мясцовага сялянства спрычынілася і тое, што ў 1915–1920 гг. Латгалія была тэатрам баявых дзеянняў. У першыя гады незалежнасці ўлады Латвіі правялі радыкальную аграрную рэформу, у выніку якой уладанні буйных землеўласнікаў былі нацыялізаваныя, а потым падзеленыя паміж дробнымі сялянскімі гаспадаркамі. Аднак рэформа не вырашыла праблемы нястачы зямлі ў латгальскай правінцыі. Асноўную частку мясцовых сялянскіх землеўладанняў складалі гаспадаркі: дробныя – да 5 га (21,29%) і сярэднія – да 20 га (59,14%). Беларускія сяляне скарысталіся рэформай у абмежаваным памеры. У сярэднім была створана адна гаспадарка на 46 сялян-беларусаў. Тым часам, на кожнага селяніна-латыша

---

[32] *20. gadsimta Latvijas vēsture. Latvija no gadsimta sākuma līdz neatkarības pasludināšanai 1900–1918*, red. V. Bērziņš, Rīga 2000, s. 221–223.

[33] *Otra tautas skaitišana Latvijā. 1925. gada 10. Februari*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1925, s. 21.

[34] К. Езавітаў. *Беларусы ў Латвіі*, с. 17.

прыпадала па адной новай гаспадарцы. Сярэдні надзел, які апынуўся ва ўласнасці апошняга, быў большы (14 га) за той, што атрымаў прадстаўнік нацыянальнай меншасці. Сярэдні памер зямельнага надзелу беларускага селяніна складаў 10,36 га, што было значна менш за сярэднестатыстычны паказнік па краіне (19,39 га). У падзеле на катэгорыі сялянскіх гаспадарак у выпадку беларусаў сітуацыя выглядала наступным чынам: сярэдні памер "старых" (дарэформенных) гаспадарак складаў 10,13 га, "новых" – 11,58 га[35].

Малазямельныя і шматдзетныя вясковыя сем'і былі вымушаны ратавацца часовымі падпрацоўкамі, каб забяспечыць сабе элементарны матэрыяльны побыт. Варта зноў звярнуцца да слоў К. Езавітава, які ў змрочных фарбах маляваў гаротнае становішча мясцовага сялянства: "*Беззямельнае і малазямельнае сялянства Латгаліі ў часы даваенныя знаходзіла сабе заробак у Петраградзе, Маскве, Рызе і Лібаве – на фабрыках і заводах, або працавала і добра зарабляла на бетонных і земляных работах пры адбудаванні чыгунак і крэпасцяў. Цяперака гэтых магчымасцяў няма, а таму, шукаючы кавалка хлеба, беззямельныя беларусы і латгальцы цэлымі тысячамі разыходзяцца па ўсёй Латвіі, нанімаючыся за самую танную цану ў батракі (парабкі) на хутары заможных латышскіх сялян у Курляндыі, Ліфляндыі і Земгаліі. На цяжкую працу ў чужыну выпраўляюцца не толькі дарослыя, але і дзеці, пачынаючы з 8–10 гадоў*"[36].

Іншай сацыяльнай катэгорыяй насельніцтва сярод латвійскіх беларусаў былі гараджане. Трэба, аднак, падкрэсліць, што прадстаўнікі беларускай нацыянальнасці ў горадзе складалі нязначны адсотак. У 1925 г. толькі 0,69% жыхароў латвійскіх гарадоў была беларусамі. У гэты час гараджане складалі 11,51% латвійскіх беларусаў. У залежнасці ад геаграфіі ў гарадах Відзэмэ налічвалася іх 43 (0,07%), Курляндыі – 197 (0,19%), Земгаліі – 884 (1,47%), Латгаліі – 1 664 (2,13%). Ва ўсёй Латвіі ў гарадах было 4 374 беларусаў. Асноўная іх колькасць пражывала ў Рызе – 1 587 (0,4%) і Даўгаўпілсе – 1 039 (2,5%)[37]. З цягам часу колькасць беларусаў у латвійскіх гарадах нязначна вырасла. У 1930 г. у гарадах пражывала ўжо 7 767, што складала 1,12% гараджан Латвіі (+0,43%)[38]. Па-ранейшаму лідарам па колькасці была сталіца краіны, дзе тады

---

[35] W. Sworakowski, *Polacy na Łotwie. Uwagi o ich liczbie i rozmieszczeniu, składzie wyznaniowym, podziale według płci i wieku, analfabetyzmie i strukturze społeczno-gospodarczej na podstawie łotewskiego spisu ludności 1930 r.*, Warszawa 1934, s. 40–43; J. Albin, *Polski ruch narodowy na Łotwie w latach 1919–1940*, Wrocław 1993, s. 40.

[36] К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, с. 25.

[37] *Otra tautas skaitišana Latvijā. 1925. gada 10. Februari*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1925.

[38] *Treša tautas skaitišana Latvijā 1930. gadā*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1930, s. 73–74. Варта дадаць, што большасць жыхароў гарадоў Латвіі складалі латышы (62,43%), габрэі (12,58%), немцы (8,46%), рускія (7,65%) і палякі (5%). W. Sworakowski, *Polacy na Łotwie. Uwagi*

жыў 4 751 беларус (1,3%). На другім месцы знаходзіўся Даўгаўпілс, у якім 1 006 (2,3%) жыхароў лічыла сябе беларусамі[39]. Больш падрабязныя звесткі пра колькасць беларусаў сярод жыхароў найбуйнейшых латвійскіх гарадоў у 1925 і 1930 гг. пададзеныя ў табліцы.

Табліца 15. Колькасць беларусаў у выбраных гарадах Латвіі ў 1925 і 1930 гг.

Горад	1925	%	1930	%
Рыга (*Rīga*)	1 587	0,46	4 751	1,26
Даўгаўпілс (*Daugavpils*)	1 039	2,5	1 006	2,33
Алукснэ (*Aluksne*)	97	2,7	8	0,22
Грыва (*Grīva*)	50	1,89	364	6,89
Ілукшта (*Ilūkste*)	20	2	14	1,16
Краслава (*Kraslava*)	428	9,6	177	4,13
Крустпілс (*Krustpils*)	88	2,49	58	1,81
Ліепая (*Liepāja*)	181	0,29	294	0,51
Лудза (*Ludza*)	64	1,1	98	1,83
Елгава (*Jelgava*)	238	0,8	268	0,81
Рэжыкнэ (*Rēzekne*)	34	0,3	181	1,43
Екабпілс (*Jēkabpils*)	535	9,4	39	0,69

Крыніца: *Otra tautas skaitišana Latvijā. 1925. gada 10. Februari,* M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1925; *Treša tautas skaitišana Latvijā 1930. gadā*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1930.

Сітуацыя не змянілася істотным чынам у наступныя гады. У 1935 г. у Рызе пражывала 4 676 (1,2%) беларусаў, у Даўгаўпілсе – 1 156 (2,5%), у Рэжыкнэ – 360 (2,7%), у Лудзы – 163 (2,9%), у Краславе – 216 (5%), у Грыве – 243 (4,3%)[40].

Як бачна, у міжваенны перыяд суадносіны паміж беларусамі-вяскоўцамі і беларусамі-гараджанамі крыху змяніліся. Колькасць апошніх вырасла: з 11,51% (у 1925 г.) да 21,56% (у 1930 г.). Гэта дазваляе зрабіць выснову, што ў дадзенай нацыянальнай групе адбываўся павольны, але паступовы міграцыйны рух з вёскі ў горад. Асноўнай прычынай быў пошук крыніцы заробку і лепшых умоў жыцця. Аднак па-ранейшаму большасць латвійскіх беларусаў жыла ў вёсках (78,44%), а ў горадзе – толькі кожны пяты (21,56%)[41].

Нягледзячы на пэўны рост лічбы беларусаў у гарадах Латвіі, яны знаходзіліся далёка ў нізе нацыянальных стытыстык. Насельніцтва кансерватыўнай

o ich liczbie i rozmieszczeniu, składzie wyznaniowym, podziale według płci i wieku, analfabetyzmie i strukturze społeczno-gospodarczej na podstawie łotewskiego spisu ludności 1930 r., Warszawa 1934, s. 7.

[39] P. Eberhardt, *Problematyka narodowościowa Łotwy*, "Zeszyty IGiPZ", nr 54 (Warszawa 1998), s. 30.

[40] *Беларускі календар. 1937 г.*, скл. С. Сахараў, Daugavpils 1937, с. 39.

[41] *Treša tautas skaitišana Latvijā 1930. gadā*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1930, s. 88.

латгальскай вёскі, у значнай ступені пад уплывам каталіцкага духавенства, не спяшалася ўрбанізавацца. Акрамя таго, частка "новых гараджан" асімілявалася ў шматнацыянальным горадзе. З гэтай прычыны прысутнасць беларусаў у гарадскім краявідзе заўважалася з цяжкасцю[42]. Іншай прычынай была нізкая запатрабаванасць на гарадскім рынку працы некваліфікаваных работнікаў, да ліку якіх належала большасць беларусаў. Беларускія гараджане працавалі ў розных галінах гаспадаркі. Найбольш – у прамысловасці, дзе напрыканцы 1920-х гг. былі занятыя 1 009 беларусаў. Тым часам, хатняй прыслугай працавала 435 беларусаў, у транспарце – 252, у сферы гандлю – 147, у іншых галінах гаспадаркі – 732[43]. У 1935 г. у горадзе на 4 344 прафесійна занятых беларусаў 2 173 працавала ў прамысловасці, 411 – у адміністрацыі, 391 – у хатняй прыслузе, 378 – у сельскай гаспадарцы, 348 – у камерцыі, 113 – у вольных прафесіях[44].

Паколькі большасць гараджан-беларусаў складалі жыхары Рыгі і Даўгаўпілса, варта асобна разгледзіць становішча беларусаў у гэтых гарадах. У 1897 г. у Даўгаўпілсе пражывала 69 675 жыхароў, але ў выніку вайны ў 1920 г. засталося іх толькі 29 003. У міжваенны перыяд камунікацыйнае значэнне горада погоршылася. З істотнага камунікацыйнага вузла Расійскай Імперыі ён ператварыўся ў перыферыйны цэнтр невялікай дзяржавы. Нягледзячы на гэта, Даўгаўпілс па-ранейшаму знаходзіўся на скрыжаванні камунікацыйных шляхоў паміж Вільняй і Псковам, Варшавай і Ленінградам, Рагай і Масквой[45]. Цягам 1920–1925 гг. колькасць жыхароў горада павялічылася з 29 тыс. да 40 тыс. Як найбуйнейшы населены пункт Латгаліі, Даўгаўпілс традыцыйна вабіў жыхароў навакольных вёсак, якія шукалі тут лепшай долі і падпрацоўкі. У іх ліку былі беларускія сяляне, якія станавіліся гараджанамі[46]. У 1935 г. у Даўгаўпілсе жыло 440 працаздольных беларусаў[47]. Пра

---

[42] У 1930 г. у Даўгаўпілсе пражывала 11 657 (27%%) латышоў, 11 636 (26,9%) габрэяў, 9 007 (20,8%) палякаў, 8 425 (19,5%) рускіх. Праз пяць гадоў у горадзе на 45,2 тыс. жыхароў латышы складалі 15,2 (33,6%), габрэі – 11,1 (24,6%), палякі – 8,2 (18,2%), рускія – 8,1 тыс. (17,8%). Тым часам, у Лудзы 5,5 пражывала 2,2 тыс. (39,8%) латышоў, 1,5 тыс. (27,3%) габрэяў, 1,2 тыс. (22,1%) рускіх, 0,4 тыс. (6,1%) палякаў, 0,2 тыс. (4,7%) – іншых. P. Eberhardt, *Problematyka narodowościowa Łotwy*, "Zeszyty IGiPZ", nr 54 (Warszawa 1998), s. 27–30, 33.

[43] *Otra tautas skaitišana Latvijā. V. Nodarbošanās,* M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1928, s. 526.

[44] *Ceturta tautas skaitīšana Latvijā 1935 gada*, sastādijīs V. Salnītis un redigējis M. Skujenieks, Rīga 1936, s. 472.

[45] P. Eberhardt, *Problematyka narodowościowa Łotwy*, "Zeszyty IGiPZ", nr 54 (Warszawa 1998), s. 27–29.

[46] *Pilsētu apraksti (pēc 1935. g. tautas, sejumu-majlopu un tirdzniecības-rūpniecības skaitīšanas materiāliem). Trešā daļa*, Rīga 1936, s. 148.

[47] *Ceturta tautas skaitīšana Latvijā 1935 gada*, sastādijīs V. Salnītis un redigējis M. Skujenieks, Rīga 1936, s. 454.

касмапалітычнасць горада сведчылі шматлікія шыльды на некалькіх мовах: латышскай, рускай, ідыш. Не было іх, аднак, па-беларуску, калі не лічыць асобных надпісаў на будынках, у якіх знаходзіліся мясцовыя беларускія грамадскія і адукацыйныя ўстановы. У 1935 г. колькасць жыхароў горада выросла да 45 160[48]. Сярод іх каталікі складалі 16 190 (35%), іўдзеі – 11 116 (24,62%), лютэране – 7 248 (16%), стараверы – 5 185 (11,48%), праваслаўныя – 5 019 (11%). Беларусы знаходзіліся ў ліку кожнай з гэтых катэгорый за выключэннем іўдзеяў і лютэранаў[49].

Асобнай увагі заслугоўвае прысутнасць беларусаў у Рызе. З прычыны таго, што беларусы траплялі ў сталіцу ў розны час і рознымі шляхамі, складана стварыць агульны партрэт беларускага рыжаніна. Досыць трапную класіфікацыю беларускіх жыхароў Рыгі зрабіў К. Езавітаў, які пісаў: "*в ы х а д ц ы з Беларусі і Латгаліі, якія самі, або іхнія бацькі, з'явіліся ў Рыгу пад канец XIX ст. і на пачатку XX ст., калі Рыга перажывала буйны ўзрост і развіццё прамысловасці; гэтая група і іхнія дзеці і маленькія ўнукі яшчэ не здэнацыянаваліся і з'яўляюцца зара асноваю беларускае грамады ў Рызе; яны не забылі яшчэ свае вёскі, часта-густа маюць з імі звязак, але ўжо на вёску ніколі не звернуцца; (...) найноўшыя выхадцы з беларускіх вёсак Латгаліі і Ілукштаншчыны, што з'явіліся ў Рыгу шукаць працы і кавалка хлеба ўжо пасля стварэння Латвійскае Рэспублікі, жывуць адной нагой у Рызе, а другой нагой у сваіх вёсках; яны яшчэ не 'зачапіліся' канчаткова за рыжскі грунт, бо не маюць пэўнае працы; на вёсцы зямлі ў іх няма, або ёсць 1– 2 дзесяціны, але стаіць така-сякая хата, – 'свой кут', у якім часова пакінута сямейка; гэтая група–цякучая. Яны то прыязджаюць у Рыгу, то зноў на нейкі час вяртаюцца ў вёску, каб зараз жа зноў прыехаць у Рыгу, як толькі даведаюцца, што тутака дзесьці распачалася нейкая праца і патрэбны працоўныя рукі; ёсць і такая група з гэтых грамадзян, што перавязла ў Рыгу сем'і, а сама працуець пад Рыгай батракамі*"[50].

Большасць рыжскіх беларусаў была нашчадкамі сялян, якія прыехалі ў горад у пошуках лепшага жыцця. Першая хваля працоўных мігрантаў датуецца яшчэ канцом XIX ст., калі горад перажываў эканамічны ўздым. Беларускія сяляне прыязджалі ў Рыгу з Віцебшчыны, Смаленшчыны, Віленшчыны, але найбольш – з Латгаліі ды Ілукшчыны. Ананімны аўтар так пісаў пра Рыгу да I сусветнай вайны: "*Усюды была чутна беларуская гутарка: і на*

---

[48] *Pilsētu apraksti (pēc 1935. g. tautas, sejumu-majlopu un tirdzniecības-rūpniecības skaitīšanas materiāliem). Trešā daļa*, Rīga 1936, s. 148.

[49] *Pilsētu apraksti (pēc 1935. g. tautas, sejumu-majlopu un tirdzniecības-rūpniecības skaitīšanas materiāliem). Trešā daļa*, Rīga 1936, s. 149.

[50] К. Езавітаў, *Беларусы ў Рызе* [у:] Сіцько С., *Дзесяцігодзьдзе 1-ае Рыскае Беларускае аснаўное школы*, Рыга 1934, с. 3.

‘таўкучцы’ і каля касцёла ў свята і ў тракцірах”[51]. У выніку вайны колькасць беларусаў у Рызе скараціласа, паколькі рабочыя заводаў “Праваднік”, “Ігельцэм”, “Фенікс” былі эвакуіраваныя ўглыб Расіі. У міжваенны час рух з вёскі ў сталіцу працягваўся, паколькі ў горадзе паступова адраджалася прамысловасць, перадусім дрэваапрапрацоўчыя фабрыкі і тартакі. Гнаныя галечай, вяскоўцы шукалі ратунку ў сталіцы. Сучаснік пісаў: “*Беларуская вёска, перажываючы страшэнны зямельны і эканамічны крызіс, што далей, то ўсё больш выкідае сваіх сыноў за борт сялянскае гаспадаркі і сялянскага жыцця. Злы лёс гоніць іх на чужыну шукаць сабе сродкаў на хлеб, гоніць іх у Рыгу на фабрыкі і заводы, гоніць і ў Курляндыю за батракоў, пастухоў і чорнарабочых па ўсёй Латвіі*”[52].

У міжваенны час латвійская сталіца мала не вярнулася ў даваенны стан. У 1935 г. у Рызе пражывала 385 063 жыхароў. Горад па-ранейшаму нагадваў шматэтнічную і шматкультурную мазаіку. У 1930-я гг. лютэране складалі 245 080 (63%), каталікі – 44 717 (11,6%), іўдзеі – 43 558 (11,8%%), праваслаўныя – 33 728 (8,76%), стараверы – 11 525 (2,99%)[53]. Адрозненнем міжваеннай Рыгі ад даваеннай было павелічэнне колькасці латышоў. Напрыклад, паводле перапісу насельніцтва 1897 г. латышскамоўныя жыхары складалі толькі 45,0%, а сярод носьбітаў іншых моваў самымі шматлікімі групамі былі нямецкамоўныя (23,9%) і рускамоўныя (16,1%). Тым часам, у 1935 г. латышоў налічвалася ўжо 63%, габрэяў – 11,3%, немцаў – 10%, рускіх – 7,3%, палякаў – 4,1%, іншых – 4,3 %. Імаверна, беларусы (4 тыс.) трапілі як у апошнюю групу, так і ў рускую, і ў польскую[54].

Большасць сталічных беларусаў складалі асобы ў працаздольным веку 20–60 гадоў. У 1930 г. іх налічвалася 2 787. Тым часам, дзяцей да 4 гадоў было 444, 4–9 гадоў – 427, 10–14 гадоў – 257, 15–19 гадоў – 445[55]. Паводле прафесіі асноўную масу беларускіх рыжан складалі рабочыя. У 1935 г. з 4 676 сталічных беларусаў 2 525 былі актыўнымі прафесійна[56]. Большасць з іх не мела прафесійных кваліфікацый, таму найчасцей працавала ў якасці хатняй прыслугі, грузчыкамі ў гавані, чорнарабочымі на фабрыках, тартаках і чыгунцы. Напрыклад, пры канцы 1920-х гг. сярод 956 працаздольных сталічных беларусаў ажно 252 працавалі хатняй прыслугай, 82 – у транспарце, 37 – выконвалі

---

[51] К. Сенкевіч, *Выхадцы беларускае вёскі у Рызе*, “Голас беларуса” 1926, № 4 ад 1 траўня, с. 1.

[52] К. Сенкевіч, *Выхадцы беларускае вёскі у Рызе*, “Голас беларуса” 1926, № 4 ад 1 траўня, с. 1.

[53] *Pilsētu apraksti (pēc 1935. g. tautas, sejumu-majlopu un tirdzniecības-rūpniecības skaitīšanas materiāliem). Trešā daļa*, Rīga 1936, s. 62.

[54] P. Eberhardt, *Problematyka narodowościowa Łotwy*, “Zeszyty IGiPZ”, nr 54 (Warszawa 1998), s. 33.

[55] *Treša tautas skaitīšana Latvijā 1930. gadā*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1930, s. 299.

[56] *Ceturta tautas skaitīšana Latvijā 1935 gada*, sastādijīs V. Salnītis un redigējis M. Skujenieks, Rīga 1936, s. 454.

разумовую працу, 16 – служылі ў войску, 7 – у паліцыі і іншых службах, 183 было занята ў іншых галінах[57]. Паколькі нізкакваліфікаваная праца кепска аплачвалася, гэтыя людзі не былі ў стане забяспечыць належную асвету сваім дзецям. Сярод сталічных беларусаў адзначаўся найвышэйшы адсотак рабочых (86,51%). Сярод прадстаўнікоў іншых нацыянальных меншасцей працэнт рабочых складаў: у латышоў 61,78%, у немцаў 43%, у габрэяў 41,10%. Не павінна здзіўляць, што найбуйнейшыя месцы канцэнтрацыі мясцовых беларусаў знаходзіліся ў рабочых кварталах, побач з буйнымі фабрыкамі і тартакамі. У 1930 г. на Маскоўскім Фарштаце (*Maskavas forštate*) налічвалася 2 055 беларусаў, у Саркандаўгаве (*Sarkandaugava*) – 827, на левым беразе Дзвіны – 855, у ваколіцах іпадрома і цэнтральнай турмы – 518. Тым часам, у цэнтральнай частцы горада пражываў толькі 441 беларус[58].

Табліца 16. Беларусы ў Рызе паводле паліцэйскіх участкаў у 1925 і 1930 гг.

Раён	**1925**	**1930**
I	32	36
II	36	32
III	108	163
IV	99	205
V	218	827
VI	224	604
VII	175	183
VIII	110	313
IX	337	1 451
X	115	323
XI	58	307
XII	69	175
XIII	6	125
Разам	1 587	4 751

Крыніца: *Otra tautas skaitišana Latvijā. 1925. gada 10. Februari,* M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1925; *Treša tautas skaitišana Latvijā 1930. gadā*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1930, s. 122.

[57] *Otra tautas skaitišana Latvijā. V. Nodarbošanās*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1928, s. 478–479.

[58] С. Раўнейка, *Беларуская дыяспара ў Рызе ў пачатку XX ст. (па матэрыялах даследавання К. Езавітава)* [у:] *Айчынная і сусветная гісторыя: сучасныя погляды і метады даследаванняў: Зб. навук. прац: У 2 ч. Ч. 2: Актуальныя пытанні ўсеагульнай гісторыі і гісторыі Беларусі*, Менск 2003, с. 204–205.

Нешматлікасць беларусаў і прыналежнасць да незаможных слаёў гарадскога насельніцтва абмяжоўвалі ўплыў на кіраванне гарадскім жыццём. Гэта пацвярджаецца іх нязначнай лічбай у органах гарадскога самакіравання. Асноўная маса сталічных беларусаў цяжка працавала і не цікавілася грамадска-культурным жыццём. Нягледзячы на гэта, К. Езавітаў сцвярджаў, што беларуская супольнасць Рыгі не была цалкам страчаная для беларускага народа, паколькі яны яшчэ не здэнацыяналізавалася і "не забыла свае вёскі". Ён лічыў, што да І сусветнай вайны рыжскія беларусы губляліся ў гушчы "рускамоўнага насельніцтва" горада і толькі з набыццём Латвіяй незалежнасці пачалі задумвацца пра сваю ідэнтычнасць. Беларускі дзеяч лічыў неабходным ахапіць рыжскіх беларусаў культурна-асветнымі арганізацыямі і ўстановамі, стварыць бюро працаўладкавання для беспрацоўных-беларусаў, а таксама наладзіць працу курсаў павышэння кваліфікацыі для беларускіх рабочых[59].

Інтэлігенцыя складала нязначную частку латвійскіх беларусаў. У 1925 г. толькі 140 з іх выконвала разумовую працу, а 33 працавала ў паліцыі і іншых службах[60]. З назіранняў К. Езавітава вынікала, што толькі невялічкая група інтэлігентаў-беларусаў (35–40 чал.) мела сталую працу. Найбольш сярод іх было настаўнікаў. Вось як ён характарызаваў становішча беларускіх інтэлігентаў: "*Трэцяя сацыяльная група беларускае меншасці – гэта 'працоўная інтэлігэнцыя'. Група гэтая вельмі невялічкая. Большасць свядомае беларускае інтэлігенцыі працуе ў якасці настаўнікаў па беларускіх школах; дзе-хто мае іншыя пасады, але магчымасцяў атрымаць іншую працу ў Латвіі дужа мала, а таму большасць абітурыентаў беларускіх гімназій паступае на настаўніцкія курсы, падрыхтоўваючыся да настаўніцкае працы на вёсцы. Матэрыяльнае становішча беларускае працоўнае інтэлігенцыі не можна назваць добрым і моцным. Аклады пенсіі вясковых настаўнікаў вельмі невялікія, а жыццё ў прыфрантовай паласе даволі каштоўнае; аклады ў Рызе значна большыя, але тутака жыццё і асабліва кватэры – дужа дарагія*"[61].

Беларусаў, якія належалі да заможных і ўплывовых слаёў латвійскага грамадства, было зусім нямнога. Тым не менш, варта прывесці некалькі прыкладаў, калі прадстаўнікам беларускай нацыянальнасці ўдавалася ўзняцца па сацыяльнай лесвіцы. Напрыклад, некаторыя зрабілі кар'еру ва ўзброеных

---

[59] С. Раўнейка, *Беларуская дыяспара ў Рызе ў пачатку XX ст. (па матэрыялах даследавання К. Езавітава)* [у:] *Айчынная і сусветная гісторыя: сучасныя погляды і метады даследаванняў: Зб. навук. прац: У 2 ч. Ч. 2: Актуальныя пытанні ўсеагульнай гісторыі і гісторыі Беларусі*, Менск 2003, с. 207.

[60] *Otra tautas skaitišana Latvijā. V. Nodarbošanās*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1928, s. 526.

[61] К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, с. 47–48.

сілах Латвійскай Рэспублікі. У 1925 г. у латвійскім войску служылі 92 беларусы (0,5% асабовага складу)[62]. Служба беларусаў у войску латвійскай дзяржавы дасюль не была прадметам даследчыцкай увагі. Аднак, дзякуючы даследаванням Э. Екабсанса, можна назваць некалькі прыкладаў. Сярод іх варта згадаць падпалкоўніка Вячаслава Руткоўскага. Ён стаў адным з першых беларусаў, якія атрымалі высокі афіцэрскі чын у латвійскай арміі. У 1921–1924 гг. гэты чалавек займаў пасаду кіраўніка тэхнічнага аддзела ў Даўгаўпілсе. Падчас службы беларус паказаў сябе як добры жаўнер і грамадзянін. У 1929 г. В. Руткоўскі служыў у памежнай варце ў якасці начальніка паста. Іншым прыкладам удзелу афіцэраў-беларусаў у латвійскім войску быў Мікалай Мілеўскі, які ў 1919 г. пайшоў туды добраахвотнікам. У 1929 г. ён атрымаў званне падпалкоўніка. Беларус шматразова кіраваў курсамі кулямётчыкаў. У 1935 г. быў звольнены з войска. Былі беларусы і сярод малодшых афіцэраў[63]. Заслугоўвае ўвагі факт, што два беларусы – Станіслаў Красневіч і Казімір Мяжэцкі – у якасці добраахвотнікаў бралі ўдзел у вайне Латвіі за незалежнасць. У міжваенны час абодва з'яўляліся актыўнымі ўдзельнікамі мясцовага беларускага нацыянальнага руху[64].

Пераважную большасць латвійскіх беларусаў складалі асобы, якія нарадзіліся ў Латвіі. Разам з тым, частка асоб беларускай нацыянальнасці паходзіла з іншых краін. Атрыманне падданства Латвіі рэгуляваў Закон аб грамадзянстве ад 23 жніўня 1919 г. У адпаведнасці з ім, грамадзянамі Латвійскай Рэспублікі маглі стаць былыя падданыя Расійскай Імперыі, якія пражывалі на тэрыторыі Латвіі да 1 жніўня 1914 г. З асоб нелатышскай нацыянальнасці грамадзянства аўтаматычна атрымлівалі толькі тыя, хто нарадзіўся ў межах Латвіі, да вайны меў тут права пастаяннага жыхарства і ў перыяд з 5 верасня 1919 г. да моманту апублікавання закону не з'яўляўся падданым іншай дзяржавы[65]. У 1925 г. ажно 96,8% прадстаўнікоў беларускай меншасці мела латвійскае грамадзянства[66]. Праз пяць гадоў лічба амаль не змянілася (95,7%). Вышэйшы адсотак грамадзян Латвіі быў толькі сярод латышоў[67]. Нязначная

---

[62] *Otra tautas skaitišana Latvijā. V. Nodarbošanās*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1928, s. 526.

[63] Э. Екабсонс, *Рутковский Вячеслав Донатович* [в:] *Белорусский след в латвийской истории*, ред. М. Королёв, Минск 2019, с. 78–79; Ён жа, *Милевский Николай Макариевич* [в:] *Белорусский след в латвийской истории*, ред. М. Королёв, Минск 2019, с. 56–58; Ён жа, *Корноухов Ян (Янис) Сергеевич* [в:] *Белорусский след в латвийской истории*, ред. М. Королёв, Минск 2019, с. 43–44.

[64] LVVA, 7427 f., 1 apr., 2915 l.; LVVA, 7427 f., 1 apr. 1, 9467 l.

[65] J. Albin, *Polski ruch narodowy na Łotwie w latach 1919–1940*, Wrocław 1993, s. 23.

[66] *Otra tautas skaitišana Latvijā. 1925. gada 10. Februari*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1925, s. 75.

[67] *Treša tautas skaitišana Latvijā 1930. gadā*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1930, s. 109.

частка беларусаў (1 530) не мела латвійскага грамадзянства. У гэтай групе польскімі падданымі было 240 чал. (амаль 5% усіх польскіх грамадзян у Латвіі)[68], савецкімі – 107, асобамі без грамадзянства – 924[69].

Не ўсе жыхары Латвіі, якія дэкларавалі беларускую нацыянальнасць, дома размаўлялі па-беларуску. Паводле перапісу 1925 г. большасць беларусаў карысталася беларускай мовай у штодзённым жыцці. Аднак 7 760 беларусаў размаўляла іншымі мовамі. Праз пяць гадоў такіх было ажно 19 222. Такім чынам, толькі 46,33% латвійскіх беларусаў карысталася беларускай мовай у штодзённым жыцці. Беларусы дэкларавалі наступныя мовы штодзённага ўжытку: беларускую – 16 593, рускую – 16 498, латышскую – 1 668, польскую – 923, нямецкую – 108, літоўскую – 13, ідыш – 5, эстонскую – 5, іншыя – 2. Разам з тым, беларуская мова была мовай штодзённай камунікацыі для 3 220 небеларусаў, у тым ліку: 1 977 латышоў, 1 138 палякаў, 80 рускіх, 18 літоўцаў, 4 немцаў, 1 габрэя і 2 прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей[70].

Гендарна беларуская меншасць дзялілася амаль пароўну. У першыя пасляваенныя гады назіралася нязначная перавага мужчын. Аднак прапорцыі паступова выраўняліся. Напрыклад, у 1920 г. на тысячу беларусаў прыходзілася 1 098 беларусак, а ў 1925 г. – 1 050. Такім чынам, суадносіны паміж мужчынамі і жанчынамі выглядалі наступным чынам: 48,5% і 51,5%[71]. Тым часам, у 1930 г. у беларускай групе на тысячу мужчын прыпадала ўжо 998 жанчын. Гэта адрознівала беларусаў ад прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей. Напрыклад, у латышоў значна пераважалі жанчыны (на тысячу мужчын было 1 138 жанчын). Яшчэ большыя дыспрапорцыі назіраліся сярод палякаў, дзе на тысячу мужчын прыпадалі ажно 1 244 жанчыны[72]. Раўнавага яскрава бачная на прыкладзе гендарнага падзелу беларускіх жыхароў найбуйнейшай латвійскай метраполіі – Рыгі. У 1930 г. сярод сталічных беларусаў было 2 364 мужчыны і 2 387 жанчын[73].

---

[68] Пераважная большасць польскіх беларусаў (103) пражывала ў Рызе. W. Sworakowksi, *Polacy na Łotwie. Uwagi o ich liczbie i rozmieszczeniu, składzie wyznaniowym, podziale według płci i wieku, analfabetyzmie i strukturze społeczno-gospodarczej na podstawie łotewskiego spisu ludności 1930 r.*, Warszawa 1934, s. 11.

[69] *Treša tautas skaitišana Latvijā 1930. gadā*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1930, s. 112.

[70] *Treša tautas skaitišana Latvijā 1930. gadā*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1930, s. 456.

[71] *Otra tautas skaitišana Latvijā. 1925. gada 10. Februari*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1925, s. 81.

[72] W. Sworakowski, *Polacy na Łotwie. Uwagi o ich liczbie i rozmieszczeniu, składzie wyznaniowym, podziale według płci i wieku, analfabetyzmie i strukturze społeczno-gospodarczej na podstawie łotewskiego spisu ludności 1930 r.*, Warszawa 1934, s. 8.

[73] *Treša tautas skaitišana Latvijā 1930. gadā*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1930, s. 195.

Табліца 17. Беларусы ў Латвіі ў 1930 г. паводле ўзроставай і гендарнай прыкметы

Узрост	Мужчыны	Жынчыны	Разам
Менш за 4 гады	2 115	2 124	4 239
5–9	2069	1936	4005
10–14	1951	1808	3759
20–24	2162	1820	3983
25–29	1414	1625	3039
30–34	1037	1414	2451
35–39	1448	1180	2328
40–44	1011	944	1955
45–49	929	908	1837
50–54	817	765	1582
55–59	783	724	1507
60–64	472	514	986
65–69	406	461	867
70–74	194	213	407
75–79	96	132	228
80–84	35	43	78
85–89	16	33	49
90–94	3	11	14
95–99	4	10	14
Больш за 100	0	2	2
Невядома	34	40	74
Разам	18 035	17 994	36 029

Крыніца: *Treša tautas skaitišana Latvijā 1930. gadā*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1930, s. 322.

Прыналежнасць беларусаў да незаможных сацыяльных груп абумовіла высокі працэнт непісьменных. У 1920 г. толькі частка латвійскіх беларусаў былі граматныя. Найбольш іх было сярод жыхароў Рыгі (69,43%), Відзэмэ (75,46%) і Курляндыі (76,26%). Аднак у месцах кампактнага пражывання латвійскіх беларусаў – у Земгаліі і Латгаліі – яны складалі адпаведна 58,67%

і 55%[74]. З цягам часу лічба тых, хто ўмеў чытаць і пісаць, расла. У 1925 г. 57,83% беларусаў Латвіі ў рознай ступені валодала граматай. Праўда, толькі 15,29% умелі гаварыць па-латышску. З часам сітуацыя змянілася, але па-ранейшаму пакідала жадаць лепшага. Згодна з вынікамі перапісу 1930 г., пісьменнымі былі 64,6% беларусаў. У розных мясцінах колькасць пісьменных заставалася рознай. Найбольш іх было сярод жыхароў Рыгі (80,59%), потым Курляндыі (77,51%) і Відзэмэ (70,76%). Найменш – у Земгаліі (64,61%) і Латгаліі (59,74%). У апошнім выпадку найгоршы вынік назіраўся ў Нова-Латгальскім павеце (50,8%), потым – у Рэжыцкім (53,64%) і Лудзенскім (59,89%). Крыху лепш сітуацыя выглядала ў Даўгаўпілскім павеце (61,68%) і сярод ілукштанскіх беларусаў (61,98%). Агульныя вынікі па краіне былі наступныя: 52,9% латвійскіх беларусаў умела чытаць, а 50,2% – пісаць (у Латгаліі адпаведна 48% і 43%, у Земгаліі – 52% і 47%, у Курляндыі – 64% і 61%, у Відзэмэ – 60% і 58%, у Рызе – 70% і 67%)[75].

Дадзены вынік быў значна горшы чым у прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей Латвіі. Пісьменных немцаў было 97,65%, эстонцаў – 94,63%, латышоў – 89,91%, габрэяў – 88,91%, палякаў – 78,13% і літоўцаў – 74,80%. Беларусы апярэджвалі толькі рускіх, сярод якіх працэнт пісьменных быў яшчэ ніжэйшы (62,74%)[76].

Колькасць беларусаў, якія ўмелі чытаць і пісаць, сістэматычна павялічвалася. Калі ў 1920 г. сярод асоб, старэйшых за 10 гадоў, пісьменныя складалі толькі 43%, дык у 1925 г. іх было ўжо 57%, у 1930 г. – 64%, а ў 1935 г. – 71%[77]. Узровень пісьменнасці быў розны ў залежнасці ад гендэрнай прыналежнасці. У 1925 і 1930 гг. сярод беларусаў ён складаў адпаведна 67% і 74%, а сярод беларусак – 48% і 54%[78]. Павелічэнне лічбы граматных адбывалася адначасова з ростам колькасці школьнай моладзі. У 1925 г. толькі 53,56% маладых беларусаў і беларусах у веку 10–15 гадоў наведвала школы, а ў 1930 г. іх было ўжо 74,79%. Асабліва гэты вынік быў заўважны ў Латгаліі, дзе працэнт вучняў вырас з 49,59% да 74,41%, а таксама ў Рызе: з 78,50% да 87,45%[79].

---

[74] *Otra tautas skaitišana Latvijā. 1925. gada 10. Februari*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1925, s. 366.

[75] *Treša tautas skaitišana Latvijā 1930. gadā*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1930, s. 338, 347.

[76] *Treša tautas skaitišana Latvijā 1930. gadā*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1930, s. 337; W. Sworakowski, *Polacy na Łotwie. Uwagi o ich liczbie i rozmieszczeniu, składzie wyznaniowym, podziale według płci i wieku, analfabetyzmie i strukturze społeczno-gospodarczej na podstawie łotewskiego spisu ludności 1930 r.*, Warszawa 1934, s. 36.

[77] M. Skujenieks, *Latvijas statistikas atlass*, Rīga 1938, s. 20.

[78] *Treša tautas skaitišana Latvijā 1930. gadā*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1930, s. 345–346.

[79] *Treša tautas skaitišana Latvijā 1930. gadā*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1930, s. 354.

Такім чынам, можна сцвердзіць, што беларускае насельніцтва трывала замацавалася на этнічнай мапе міжваеннай латвійскай дзяржавы. Тутэйшым беларусам быў уласцівы нізкі ўзровень нацыянальнай свядомасці, што з'яўлялася прычынай істотных змен іх колькасці падчас перапісаў насельніцтва. Асноўным месцам іх кампактнага пражывання была паўднёвая і ўсходняя частка Латгаліі, а таксама асобныя воласці Ілукштанскага павета Земгаліі. З цягам часу расла колькасць беларусаў у Рызе і іншых частках "балтыйскай" Латвіі, што было вынікам павольнай, але сталай міграцыі сялян у гарады ў пошуках лепшай долі. Нягледзячы на гэта, цягам усяго міжваеннага перыяду асноўным месцам жыхарства беларускай меншасці заставалася паўднёва-ўсходняя Латвія. Латвійскія беларусы не належалі да эканамічнай эліты краіны, знаходзіліся ўнізе сацыяльнай лесвіцы латвійскага грамадства. Кепскія сацыяльна-эканамічныя паказнікі абумовілі значны адсотак у беларускай супольнасці непісьменных асоб, якія не праяўлялі грамадскай актыўнасці. Тым не менш, менавіта гэтыя людзі сталі базай развіцця мясцовага беларускага грамадска-палітычнага і культурна-асветнага руху.

Стаўленне латвійскіх улад і палітычнай эліты да беларускай меншасці

Нацыянальная палітыка была адной з галоўнай праблем, на якую ўрадавыя колы Латвіі мусілі звяртаць пільную ўвагу. Яе важнасць была абумоўленая шматнацыянальнасцю латвійскай дзяржавы і яе геапалітычным становішчам. На нацыянальную палітыку ўлад у Рызе ўплываў шэраг фактараў. Латвійская дзяржава, як і іншыя краіны Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, мусіла, згодна з пастановамі Парыжскай мірнай канферэнцыі, прыняць на сябе абавязкі па ахове нацыянальных, этнічных, моўных і рэлігійных меншасцей. Латвія паспяхова і без ваганняў выконвала г.зв. малы версальскі трактат. Разам з тым, на стаўленне латвійскага кіраўніцтва да нацыянальных меншасцей уплывалі гістарычныя і сацыяльна-эканамічныя фактары. Паміж тытульнай нацыяй і нацменамі існавалі не толькі адрозненні гістарычныя і культурныя, але таксама палітычныя і эканамічныя. Латышскае насельніцтва дамінавала ў вёсцы, але ў гарадах пражывала значная колькасць нелатышоў. Напрыклад, у 1919 г. у Рызе латышы складалі толькі 51,5% жыхароў. На стаўленне да нацыянальных меншасцей уплывала тое, што латышы як "сялянскі народ" працяглы час знаходзіліся пад іншаземным панаваннем, культурнай і гаспадарчай дамінацыяй – нямецкай і рускай. Колькасна ў сельскай мясцовасці латышы дамінавалі, але амаль палова воранай зямлі знаходзілася ў руках нелатышоў: немцаў – у Курляндыі і Відзэмэ, палякаў – у Латгаліі. Такая спадчына паўплывала на стаўленне ўлад да гэтых двух нацыянальных

груп. Недавер узмацняла прысутнасць значнай колькасці нелатышоў у судах, рамесніцтве, прамысловасці, гандлёвай сферы. Насцярогу ў дачыненні да нелатышоў (немцаў, рускіх, палякаў) узмацнілі падзеі I сусветнай вайны і перыяду змагання Латвіі за незалежнасць. Тады значная частка польскіх буйных землеўласнікаў не разумела латышскіх незалежніцкіх памкненняў і спадзявалася на далучэнне "Польскіх Інфлянтаў" да польскай дзяржавы. А многія немцы і рускія са зброяй у руках спрабавалі знішчыць маладую латвійскую дзяржаўнасць[80].

У сувязі з гэтым латвійскія палітычныя эліты імкнуліся аслабіць палітычныя і гаспадарчыя пазіцыі нелатышоў, але з іншага боку разумелі патрэбу мірнага суіснавання з імі. Разлік рабіўся на добраахвотную і паступовую асіміляцыю, што, аднак, не выключала адміністрацыйнага ціску і прымусу. Становішча некаторых нацменаў змянілася пасля аграрнай рэформы, якая пазбавіла нямецкую і польскую арыстакратыю шматвекавога зямельнага дамінавання. З аграрнага краявіду зніклі нямецкія і польскія буйныя латыфундыі, а 65% іх зямель апынулася ў руках латышскіх сялян. У выніку істотным чынам павялічылася колькасць сярэдніх сялянскіх гаспадарак фермерскага тыпу. Разам з парцэляцыяй у Курляндыі і Відзэмэ зніклі ачагі нямецкай, а ў Латгаліі – польскай культуры, бо многія абшарнікі, пазбаўленыя сваіх уладанняў, мусілі пакінуць Латвію. Палацы і маёнткі, якія перайшлі ва ўласнасць дзяржавы, ператвараліся ў школы і дзяржаўныя ўстановы або занепадалі. Такім чынам, дзякуючы аграрнай рэформе, была дасягнута яшчэ адна мэта: нелатышскі элемент (перадусім нямецкі і польскі) у краіне быў значна аслаблены ў палітычным і сацыяльна-эканамічным сэнсе[81].

Істотнай падзеяй, якая мела ўплыў на становішча нацменаў, было замацаванне на заканадаўчым узроўні пераходу дзяржавы на латышскую мову. Адбылося гэта 20 лістапада 1921 г. Некаторыя нацмены (немцы, габрэі, рускія) былі супраць такога кроку, бо бачылі ў ім абмежаванне іх нацыянальных моў у публічнай сферы. Спробы пэўных палітычных сіл узмацніць значэнне тытульнай нацыі коштам інтарэсаў іншых нацыянальных груп назіраліся цягам усяго перыяду існавання дэмакратычнай латвійскай дзяржавы. Знаўца палітычнай гісторыі міжваеннай Латвіі, польскі гісторык Пётр Ласоўскі піша: "*У першы перыяд парламентарызму (…) у Латвіі пазначыліся тэндэнцыі да памяншэння правоў нацыянальных меншасцей. Асабліва ўздымаліся шматлікія галасы, каб абмежаваць школьную справу. Намаганні прадстаўнікоў меншасцей, скіраваныя на атрыманне шырэйшай культурнай аўтаноміі, скончыліся нічым. У колах латвійскіх правых сіл было досыць пашыранае*

[80] P. Łossowski, *Kraje bałtyckie na drodze od demokracji parlamentarnej do dyktatury: 1918–1934*, Wrocław 1972, s. 57, 61.

[81] J. Albin, *Polski ruch narodowy na Łotwie w latach 1919–1940*, Wrocław 1994, s. 37–41.

меркаванне, што альбо Латвія стане аднароднай краінай, альбо чакае яе пагібель"[82].

Нягледзячы на асіміляцыйныя настроі ў асяроддзі латышскіх палітычных эліт, трэба адзначыць, што наогул у перыяд парламенцкай дэмакратыі ў Латвіі не было сур'ёзнай пагрозы для існавання аўтаноміі нелатышоў. Больш за тое, латвійская дзяржава забяспечыла нацыянальным меншасцям шырокія правы і свабоды, якіх яны не мелі ў іншых краінах. Гарантам для нацыянальных меншасцей было дэмакратычнае заканадаўства, якое давала ім значную культурна-асветную аўтаномію. Нацыянальная палітыка была своеасаблівым паказнікам дэмакратычных свабод у краіне. Амаль усе прадстаўнікі міжваеннай латвійскай палітычнай сцэны да сярэдзіны 1930-х гг. лічылі дэмакратыю падмуркам незалежнасці. Канстытуцыя і іншыя заканадаўчыя акты гарантавалі роўныя правы ўсім грамадзянам, незалежна ад нацыянальнасці. У выніку Латвія была адной з нешматлікіх краін міжваеннай Еўропы, дзе нацыянальныя меншасці мелі шырокія правы і магчымасці ў галіне асветы і культуры. У параўнанні з іншымі краінамі рэгіёну Латвійская Рэспубліка (побач з Эстоніяй) стварыла найбольш аптымальныя ўмовы для нацыянальна-культурнага развіцця нацыянальных меншасцей. Толькі ў гэтых дзвюх балтыйскіх краінах культурна-асветныя патрэбы нацменаў фінансаваліся з дзяржаўнага бюджэту на сталай аснове. Прадстаўнікі нятытульных нацый атрымалі нават большыя правы, чым гэтага патрабавала тагачаснае міжнароднае права. Ім давалася магчымасць мець шырокую нацыянальна-культурную інфраструктуру: школы, грамадскія арганізацыі, прэсу і г.д. Вядомыя выпадкі, калі прадстаўнікі нацыянальных меншасцей былі чальцамі ўрада або засядалі ў высокіх дзяржаўных органах. У гэтым кантэксце не гучаць пераканаўча словы дарадца Польскага пасольства ў Рызе, які сцвярджаў, што, нягледзячы на шматлікія прывілеі ў галіне культуры і асветы, сітуацыя нацменаў была складанай, бо ва ўмовах манаполіі латышоў у дзяржаўным апараце і гаспадарчых установах нацмены не мелі вялікіх шанцаў на кар'еру[83].

Зараз варта адказаць на пытанне: як латвійскія ўлады ставіліся да беларускай меншасці. Частка латвійскіх палітычных дзеячаў была прыхільная да мясцовых беларусаў і іх культурных патрэб, асабліва ў першай палове 1920-х гг. Сярод палітыкаў, якія спрыялі беларускай дзейнасці, трэба ўзгадаць першага міністра замежных спраў і старшыню Рады міністраў Латвіі Зігфрыдса Мееровіцса (*Zigfrīds Meierovics*), а таксама першага прэзідэнта Латвіі Яніса Чакстэ (*Jānis Čakste*). Прыхільным да беларусаў быў

[82] P. Łossowski, *Kraje bałtyckie na drodze od demokracji parlamentarnej do dyktatury: 1918–1934*, Wrocław 1972, s. 59.

[83] AAN, sygn.: MSZ, t. 5290, Raport pt. Mniejszości narodowe na Łotwie, 1 III 1929 r.

і Яніс Райніс (*Jānis Rainis*), актыўны дзеяч латвійскай сацыял-дэмакратыі, дэпутат Устаноўчага сходу Латвіі, адзін з аўтараў Канстытуцыі краіны. У жніўні 1923 г. прэзідэнт Латвіі наведаў Лудзу, дзе сустрэўся з прадстаўнікамі беларускай меншасці Кастусём Езавітавым і Рыгорам Плыгаўкам. Апошні падзякаваў кіраўніку дзяржавы за тое, што беларусы ў краіне не адчуваюць сябе пасынкамі[84].

Аналіз даступных крыніц дазваляе сцвярджаць, што прыхільнае стаўленне ўлад у Рызе да беларускай меншасці ў першыя гады незалежнасці Латвійскай Рэспублікі было праявай прагматычнай палітыкі. Як ужо адзначалася, дзейнасць Вайскова-дыпламатычнай місіі БНР не зрабіла ўплыву на стан беларускай самасвядомасці тутэйшага насельніцтва, паколькі латышскія ўдалы забаранялі беларускім палітыкам весці працу сярод асоб, якія мелі латышскае грамадзянства. З цягам часу палітычны клімат змяніўся на карысць беларускіх дзеячаў. Гэтаму паспрыяла ўнармаванне пытання дзяржаўных межаў Латвійскай Рэспублікі. 11 жніўня 1920 г. у Рызе была падпісаная мірная дамова паміж Латвіяй і РСФСР, паводле якой апошняя прызнавала Латгалію часткай латвійскай дзяржавы. Латышы пераканаліся, што БНР не ў стане захавацца і абараніць свае тэрыторыі. У гэты час латвійскі бок перастаў разглядаць беларусаў як фактар, які ствараў пагрозу для тэрытарыяльнай цэласнасці. Беларускамоўнае насельніцтва Латгаліі ператварылася ва ўнутраную справу Латвіі. Больш за тое, беларусы сталі міжвольным хаўруснікам маладой латвійскай дзяржавы ў яе магчымых тэрытарыяльных спрэчках з Польшчай. Паспрыялі гэтаму супярэчнасці інтарэсаў паміж Латвіяй і нацыянальнымі меншасцямі Латгаліі – польскай і рускай. Гэтыя нацыянальныя групы былі больш заможнейшыя за беларусаў і лепш арганізаваныя ў палітычным і культурна-асветным сэнсе. Палітыкі ў Рызе бачылі ў іх пэўную небяспеку для тэрытарыяльнай цэласнасці. У прыватнасці, латвійскі бок асцерагаўся росту польскага руху ў Латгаліі і на Ілукшчыне (гл. раздзел IV). Беларусаў разглядалі як супрацьвагу польскім і рускім уплывам. Горш арганізаваныя беларусы маглі аслабіць рускую і польскую актыўнасць у рэгіёне і паралізаваць іх прэтэнзіі на гэту частку Латвіі. З гледзішча інтарэсаў латвійскай дзяржавы лепш было падтрымліваць кепска арганізаваных беларусаў у супрацьвагу мацнейшым у арганізацыйным, палітычным і гаспадарчым сэнсе палякам і рускім[85].

Пацвярджэннем асэнсаванасці такой палітыкі могуць быць дзеянні і заявы латвійскіх дзяржаўных дзеячаў. Кіраўнік школьнай управы Даўгаўпілса

---

[84] *У Латвіі*, "Крывіч" 1923, № 3, с. 62.

[85] J. Gierowska-Kałłaur, *Stosunek państwa łotewskiego do miejscowych Polaków i Białorusinów w początkach niepodległości łotewskiej*, "Studia z Dziejów Rosji i Europy Środkowo-Wschodniej" 2011, t. 46, s. 193–194.

Себастыян Паберж 15 красавіка 1924 г. пісаў у Міністэрства асветы: "*Латышы павінны падтрымліваць дзеянні беларусаў да моманту, пакуль мы не ўзмацнімся, тым самым мы аслабім польскія ўплывы. Асабліва належыць так рабіць у шасці гмінах Ілукштанскага павета, пра лёс якіх – далучэнне да Польшчы – штодзённа ўсё мацней пачынаюць рупіцца шавіністычна настроеныя польскія дзеячы (…) таму пажадана, каб перапіс насельніцтва ў 1925 г. узмацніў беларускія ўплывы. Гэтым самым мы аслабім небяспечныя з гледзішча дзяржаўных інтарэсаў польскія ўплывы, а адначасова ўзмацнім латышскасць*"[86]. У сувязі з гэтым не павінны здзіўляць словы міністра З. Мееровіцса, які адзначаў, што "калі б беларусаў у Латвіі не было, дык іх належала б прыдумаць"[87]. У гэтым кантэксце цалкам зразумелае жаданне ўлады завысіць лічбу беларусаў падчас першага ўселатвійскага перапісу насельніцтва 1920 года, калі перапісныя камісары залічвалі да беларусаў нацыянальна маласвядомых славянамоўных латгальскіх сялян. Гэта было магчыма, бо апытальны аркуш утрымліваў пытанні як пра нацыянальнасць, так і пра мову штодзённага ўжытку. У сітуацыі, калі непісьменныя сяляне не былі ў стане адназначна акрэсліць сваю нацыянальную прыналежнасць, чыноўнікі запісвалі іх беларусамі на той падставе, што яны размаўлялі мясцовым беларускім дыялектам. Вынікі перапісу далі мясцовым беларускім актывістам фармальныя падставы патрабаваць стварэння ў краіне беларускай нацыянальна-культурнай аўтаноміі.

Бягучую палітычную кан'юнктуру добра разумелі мясцовыя беларускія дзеячы. Напрыклад, Уладзімір Пігулеўскі прызнаваў, што дапамога з боку латвійскай дзяржавы паспяхова нейтралізуе антыбеларускія дзеянні прадстаўнікоў мясцовых рускага і польскага рухаў[88]. У сувязі з гэтым беларускія лідары ў Латвіі не стамляліся падкрэсліваць лаяльнасць да латвійскай дзяржавы. Вышэйзгаданы У. Пігулеўскі сцвярджаў, што кіраўнікі беларускага нацыянальнага руху ў Латвіі ў аснову сваёй дзейнасці паклалі прынцып шчыльнага супрацоўніцтва і садружнасці з латышскім народам, якому блізкія і зразумелыя нацыянальна-культурныя імкненні беларусаў. Лозунг латышска-беларускага збліжэння экспанаваўся не толькі ў Латвіі, але і за мяжой. У віленскай газеце "Змаганьне" ад 2 снежня 1923 г. У. Пігулеўскі пісаў: "*Рэальныя перспектывы як бліжняга, так і далейшага часу патрабуюць ад нас уважліва прыглядацца і шукаць збліжэння толькі з нацыянальнымі латышскім коламі, бо, калі галоўную работу нашага беларускага нацыянальнага*

---

[86] Цыт.: Э. Екабсонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [в:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 50.

[87] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 95, л. 4.

[88] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 56, л. 60.

будаўніцтва ў Латвіі мы павінны праводзіць сваімі рукамі, дык усё-ткі поруч з латышамі. Наш шлях мусіць быць цвёрды і верны: арганізоўваць беларускае сялянства і, дапамагаючы латышскаму народу ў арганізацыі яго дзяржавы, разам з ім будаваць нацыянальная-культурнае беларускае жыццё ў Латвіі"[89].

Такі погляд падзялялі іншыя беларускія актывісты ў Латвіі. Кастусь Езавітаў адзначаў, што "*свой лёс у Латвіі беларусы маглі шчыра звязаць і даверыць толькі латышскай большасці, якая ў сваёй адраджэнчай гісторыі, працы і ідэалогіі шмат мела супольнага з беларусамі*"[90]. Гэты ж дзеяч пісаў у верасні 1922 г.: "*Зусім зразумела, што гэта будзе шкодна не толькі нам, але і Латвійскай Дзяржаўнасці, якую мы тутака падтрымліваем больш шчыра і свядома, бо мы лішэны нават вазможнасці аб якім-небудзь сепаратызме думаць, бо запраўды не маемо ДРУГОЙ родзіны, другой БАЦЬКАЎШЧЫНЫ, якая нас маніла бы да сябе і давала-бы нам большую свабоду культурна-нацыянальнай працы (...) Едыны наш хаўруснік у Латвіі ЛАТВІЙСКІ ЎРАД і ЛАТЫШСКІ НАРОД*"[91].

Тым часам адзін з аўтараў газеты "Голас беларуса" адзначаў, што ўзаемная згода адпавядае абодвум народам. Ён пераконваў, што, насуперак запэўніванням некаторых правых латышскіх палітыкаў, беларусы не ствараюць пагрозы для Латвіі. Сцвярджаў, што складана сабе ўявіць незалежнасць Беларусі без незалежнай Літвы і Латвіі. Адначасова аўтар выказваў думку, што ў выпадку стварэння незалежнай беларускай дзяржавы землі, населеныя беларусамі, якія знаходзяцца ў межах Латвіі, не стануць аб'ектам беларускіх тэрытарыяльных прэтэнзій. У артыкуле чытаем: "*Немагчыма сабе прадставіць беларускага гаспадарства без незалежнай Латвіі і гэтай-жа Літвы. Прылучаная да Латвіі частка беларускае зямлі бяссумліву пры тварэнні беларускага гаспадарства жаднага значэння не магла-б мець. Мы заўсёды прымушаны будзем бараніцца ад нашых усходніх і заходніх славянскіх суседзяў і заўсёды трэ' будзе захаваці найлепшыя адносіны з Латвіяй і Літвой*"[92]. Далей аўтар сцвярджаў, што латгальскія беларусы задаволяцца нацыяльна-культурнай аўтаноміяй у складзе Латвіі ў імя захавання добрасуседскіх латвійска-беларускіх адносін і супольнай небяспекі з боку Расіі і Польшчы. Акрамя таго, ён лічыў, што існаванне беларускай нацыянальна-культурнай аўтаноміі карыснае для латвійскай дзяржавы. Аўтар пераконваў, што адсутнасць беларускага руху ў Латгаліі толькі ўзмацніць актыўнасць мясцовых палякаў і рускіх, што ў перспектыве створыць небяспеку тэрытарыяльнай цэласнасці Латвіі: "*Каму карысна, каб паміж двух суседніх*

---

[89] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1525; БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 56, л. 59; LVVA, 2125 f., 5 ap., 105 l., 13 lp.

[90] К. Езавітаў, *op. cit.*, s. 56.

[91] LVVA, 2125 f., 5 ap., 39 l., 59 lp.

[92] Давідовіч, *Латыска-Беларускія Адносіны*, "Голас беларуса" 1925, № 11, с. 1.

народаў, што не мелі ніколі непаразуменняў, што жылі з сабой спрадвеку ў згодзе і прыязні, каму карысна, каб паміж гэтымі двума ўзаемна зацікаўленымі дзяржаўна і нацыянальна народамі ўзнялася сварка! Пэўна камусь карысна, але толькі не беларусам і латышам. А што Латвія зацікаўлена ў незалежнасці Беларусі, гэта разумее кожны палітык (...) Няхай як ёсць дагэтуль, беларусы астаюцца лаяльнымі й прыязнымі да латышоў і Латвіі і няхай латвійскі ўрад вернецца да нядаўнае свае палітыкі ў адносінах да беларусаў. Ад латвійскіх беларусаў залежыць няшмат – гэта не даць нікому сябе справакаваць. Але ад латвійскага ўраду залежыць вельмі шмат, ад яго ў поўнай меры залежыць, ці будуць адносіны нармальныя й прыязныя, ці наадварот, ненармальныя, з якіх скарыстаюць розныя, нашыя і латышскія, супольныя непрыяцелі"[93].

Беларускія дзеячы хацелі, каб спрыяльны беларусам дзяржаўны курс не мяняўся. Таму яны крытыкавалі тых латвійскіх палітыкаў, якія бачылі ў беларусах пагрозу для Латвіі і заклікалі да ліквідацыі або абмежавання беларускай культурна-асветнай актыўнасці. Беларуская актывісты асуджалі выпадкі, калі беларускім сялянам прыпісвалі латышскую нацыянальнасць. Дадзеныя спробы называліся згубнай і шкоднай для Латвіі і латышоў "латышызацыяй" і "асіміляцыяй"[94].

Незалежна ад палітычнай лініі ўлады ў Рызе, адносіны да беларусаў з боку мясцовай адміністрацыі і самакіравання былі рознымі. Частка чыноўнікаў і прадстаўнікоў органаў самакіравання не бачыла патрэбы падтрымліваць беларускі рух. Гэта адбілася падчас арганізацыі беларускіх школ у Латгаліі, пра што больш падрабязна будзе ісці гаворка ў наступных падраздзелах. Непрыхільнае стаўленне некаторых чыноўнікаў і палітыкаў да нацыянальна-культурных патрэб беларускай меншасці вынікала з факту, што мясцовая адміністрацыя і самакіраванне складаліся з прадстаўнікоў нацыяльныях груп, інтарэсы якіх супярэчылі беларускім. У залежнасці ад стаўлення да беларускай меншасці К. Езавітаў падзяляў латвійскае грамадства на чатыры катэгорыі: 1) нешматлікія прыхільнікі беларускага адраджэння ("*невялічкая група высокаінтэлігентных латышскіх дзеячаў, добра памятаючых гісторыю адраджэння свайго народу, многа працаваўшых над гэтым адраджэннем, добра ведаючых цяжар усіх пачынанняў на гэтым кірунку*"), 2) шматколькасная маса абыякавых і малаабазнаных пра беларусаў (іх погляды на беларусаў фарміраваліся пад уплывам прэсы), 3) "вялікарускія і польскія шавіністы"

---

[93] Давідовіч, *Латыска-Беларускія Адносіны*, "Голас беларуса" 1925, № 11, с. 1.

[94] *Перарабляюць беларусаў на латышоў*, "Голас беларуса" 1926, № 40, с. 4; *Латышызацыя беларусаў*, "Голас беларуса" 1925, № 11, с. 1; Давідовіч, *Латыска-беларускія адносіны*, "Голас беларуса" 1925, № 11, с. 1–2; *Як аўкнецца, гэтак і адгукнецца*, "Голас беларуса" 1925, № 14, с. 1; *Палітычная блізарукасьць*, "Голас беларуса" 1926, № 42, с. 1.

і іх хаўруснікі (“*варожа ставяцца да беларускага руху, бо ён замінае ім развівацца*”), 4) група, якая імкнецца зрабіць палітычную кар’еру на беларусах. Апошніх беларускі дзеяч лічыў найбольш шкоднымі і небяспечнымі і вінаваціў у даносах і паклёпніцтве[95]. Шукаючы прычын адмоўнага стаўлення да беларускай меншасці часткі мясцовых палітычных і інтэлектуальных эліт, ён пісаў: “*Большасць латвійскае інтэлігенцыі, у тым ліку і дэпутаты Сойму, выхаваліся ў расейскай школе, якая вучыла, што беларусы ёсць малодшыя браты велікаросаў, што ніякае свае культуры ў беларусаў няма, што беларуская мова гэта – ‘нарэчые’ расейскае мовы, што беларускае літаратуры не існуе і г.д. Калі распачалася арганізацыя беларускае меншасці, а разам з тым і расейска-польская саюзная кампанія супраць беларусаў, дык дужа многія з гэтых латышскіх інтэлігентаў, чытаючы расейскія газеты і падпадаючы пад персанальную антыбеларускую агітацыю многалічных велікарускіх і польскіх дзеячоў, пачыналі ставіцца да беларусаў з падазронасцю, як да новага і незразумелага для іх з’явішча. Беларускі рух здаваўся ім штучнай з’явай, якая выклікана не натуральным і зусім праўным імкненнем беларуса да нацыянальнага самавызначэння, а нечымі таемнымі інтрыгамі, шкоднымі для Латвіі*”[96].

Аналіз гістарычных фактаў дазваляе меркаваць, што ацэнка беларускага дзеяча была досыць павярхоўнай. У сапраўднасці стаўленне да беларусаў было складанейшай з’явай, якая заслугоўвае разгляду. Нізкі ўзровень пісьменнасці і несфарміраванае пачуццё нацыянальнай ідэнтычнасці беларускамоўных жыхароў паўднёва-ўсходняй Латвіі давалі латвійскім палітыкам значнае поле да разважанняў на тэму: кім з’яўляюцца мясцовыя беларусы? У першыя гады незалежнасці Латвійскай Рэспублікі прэса, незалежна ад палітычнай арыентацыі, нярэдка пісала словы “беларус” і “беларускі” ў двукоссі, а ў нацыянальных статыстыках выкарыстоўвалася рубрыка “рускія”, якая падзялялася на беларусаў (*Baltkrievi*) і вялікарусаў (*Lielkrievi*). Іншымі словамі, аўтары ставілі пад сумнеў факт паўнавартаснага існавання гэтай нацыі. Беларускае пытанне найчасцей гучала ў латвійскім палітычным дыскурсе ў сувязі са школьнай справай. Частка латвійскай палітычнай эліты была схільная разглядаць беларускіх дзеячаў як групу дзівакоў, што насуперак гістарычнай логіцы ствараюць “штучны псеўданарод”, каб атрымаць ад дзяржавы грашовую падтрымку на свае школы і адукацыю[97]. Час, аднак, паказаў, што беларуская ідэнтычнасць з’яўляецца трывалай і натуральнай

---

[95] *1921–1925*, “Голас беларуса” 1925, № 1, с. 1.

[96] К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, Рыга 1927 [перадрук: Нью-Ёрк–Менск 2013], с. 58.

[97] М. Голдманис, *“Белорусский” дискурс в латышской прессе (1920–1934): эволюция представления о белорусах как о самостоятельном национальном меншинстве*, “Латыши и белорусы: вместе сквозь века”, Минск 2016, № 5, с. 69–70.

з'явай. Беларусы здолелі замацавацца на грамадска-палітычным краявідзе Латвіі, а кожная палітычная сіла ў краіне мусіла лічыцца з імі. Да супрацоўніцтва з нацменамі, у тым ліку з беларусамі, былі схільныя палітыкі левай плыні, найбольш уплывовымі з якіх з'яўляліся сацыял-дэмакраты. У першыя гады незалежнасці менавіта яны складалі большасць у парламенце, блакуючы ініцыятывы правых сіл, скіраваныя супраць нелатышоў. Як ужо адзначалася, прыхільна да беларусаў ставіўся сацыял-дэмакратычны дзеяч Я. Райніс. На пачатку 1920-х гг. палітык неаднаразова бараніў беларусаў як у соймавай зале, так і на старонках латвійскай прэсы. Ён лічыў, што беларусы ў Латвіі павінны атрымаць належную ім культурную аўтаномію, якой яны былі пазбаўленыя ў іншых краінах[98].

Разам з тым, нават сацыял-дэмакраты ведалі, што працэс фарміравання беларускай нацыянальнай свядомасці яшчэ працягваецца, а беларускасць некаторых жыхароў Латгаліі з'яўляецца з'явай няўстойлівай. Так лічыў Маргерс Скуенієкс (*Marģers Skujenieks*), дэпутат Сойма з шэрагаў сацыял-дэмакратаў (пазней прагрэсістаў), кіраўнік ураду ў 1926–1928 і 1931–1933 гг. Ён працяглы час кіраваў Латвійскім статыстычным упраўленнем. У сваёй кнізе "*Latvija: zeme un iedzīvotāji*" ("*Латвія: зямля і людзі*") ён выказаўся пра латгальскіх беларусаў як пра "спаланізаваных латышоў"[99].

Халоднае стаўленне да нелатышоў, у тым ліку беларусаў, адчувалася на правым баку латвійскай палітычнай сцэны. Беларускія дзеячы не маглі разлічваць на падтрымку правых партый. Нягледзячы на тое, што іх лідарам не быў уласцівы расізм, многія з іх часамі аперавалі лозунгам "Латвія для латышоў". Праўда, у адрозненні ад крайніх нацыяналістаў, памяркоўныя правыя палітыкі разумелі гэты лозунг як палітыку эканамічнай, культурнай і палітычнай падтрымкі латышоў[100]. Правыя сілы бачылі ў шматнацыянальнасці Латгаліі небяспеку страціць гэту тэрыторыю. Праз гэта і ставіліся да мясцовых беларусаў без эмпатыі. Латвійская правая прэса друкавала артыкулы, у якіх даводзілася, што латгальскія беларусы гэта наступства асіміляцыі латышоў. 5 ліпеня 1923 г., падчас абмеркавання школьнага бюджэту на 1923/1924 навучальны год, дэпутат Латвійскага сялянскага саюза Яніс Гольдманіс (*Jānis Goldmanis*) не хаваў, што лічыць беларускі рух у Латгаліі штучнай з'явай[101]. У іншых выказваннях прыхільнікаў правых поглядаў

---

[98] Э. Екабсонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [в:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 51.

[99] Т. Кузнецова, *Белорусы в информационном пространстве Латвии 20–30-х годов XX века: М. Скуениекс "Латвия. Страна и жители" (M. Skujenieks "Latvija. Zeme un iedzīvotāji")*, "Латыши и белорусы: вместе сквозь века", Минск 2015, № 4, с. 38–39.

[100] *История Латвии XX век*, Д. Блейере, И. Бутулис, А. Зунда и др., Рига 2005, с. 155.

[101] *Государственный бюджэт в Сейме*, "Рижский курьер" 1923, 5 июля, с. 3.

можна было пачуць, што беларускі рух гэта праява камуністычнай дзейнасці і нелаяльнасці да латвійскай дзяржавы (газета "Latvis")[102].

Насцярожана ставіліся да беларускай дзейнасці прадстаўнікі латгальскага нацыянальнага руху, якія стаялі на грунце латвійскай дзяржаўнасці, але з захаваннем гістарычных, культурных і гаспадарчых асаблівасцей свайго рэгіёну. Іх праграма не прадугледжвала існавання на мясцовым краявідзе беларусаў, якія лічыліся славянізаванымі латгальцамі. Мясцовы беларускі рух разглядаўся латгальскімі палітыкамі як канкурэнт у змаганні "за душы і сэрцы" мясцовага сялянства. Асабліва адмоўнае стаўленне да беларусаў займаў лідар Партыі латгальскіх дэмакратаў Францыс Кэмпс (*Francis Kemps*), які пазней выклаў свае погляды на беларускае пытанне ў кнізе "*Latgales likteni*" ("*Латгальскія лёсы*"). На думку аўтара, каталікі-беларусы Латгаліі не маюць нічога супольнага з праваслаўнымі беларусамі з Віцебскай, Менскай і Полацкай губерняў. Ён лічыў беларускую ідэнтычнасць у Латгаліі вынікам панавання чужынцаў, шкоднага для латгальскай нацыянальнай свядомасці. Даводзячы, што беларускасць у краі штучная, ён адзначаў: усе мясцовыя беларусы – гэта каталікі, якія разумеюць на аднолькавым узроўні беларускую і латгальскую мовы. Палітык тлумачыў, што беларусы гэта "зрусіфікаваныя латгальцы", якіх неабходна "вярнуць да сваёй нацыі", а беларускай мовы ў Латгаліі не існуе, бо ёй ніхто тут не карыстаецца. Свае тэзісы па беларускім пытанні ён неаднаразова друкаваў у прэсе. Беларусы былі вымушаныя рэагаваць на выступ латгальскага палітыка. Кіраўнік Беларускага школьнага аддзела ў лісце да рэдактара адной з латвійскіх газет аспрэчваў сцвярджэнне, нібыта, усе беларусы ведаюць латгальскую мову, пераконваючы, што ёсць мясцовасці, дзе беларускія жыхары ўвогуле не разумеюць па-латгальску. Найбольшае абурэнне беларусаў выклікалі словы Ф. Кэмпса пра тое, што беларусы з'яўляюцца пагрозай для латвійскай дзяржавы. У вышэйзгаданым лісце чытаем: "*Мы цалкам пакідаем па-за ўвагай тыя месцы п. Кэмпса, у якіх ён робіць розныя намёкі на асобы кіраўнікоў беларускага руху, а таксама і на сам рух, характарызуючы іх як супрацьнародныя і небяспечныя для дзяржаўнасці Латвіі, бо цвёрда верым у цвярозасць розуму латышскага народа і здатнасць яго разабрацца ў яўным паклёпе, – але затое не можам пакінуць без рашучага і катэгарычнага пратэсту ганебную прапанову п. Кэмпса ператварыць беларусаў у латгальцаў праз узмоцненае і штучнае асіміляванне іх. Да такіх прапановаў рэдка дагаворваліся нават расійскія чарнасоценцы, кшталту Маркава П., і не заўжды наважваюцца ўслых марыць польскія зубры. Беларускі рух у Латгаліі не цягнецца ні да Масквы, ні да Віцебска; не жадае ён спазнаваць і 'Заходнюю Культуру' ў польскай рэдакцыі і праз пасрэдніцтва Варшавы, але, з'яўляючыся грамадзянамі Латвіі,*

[102] *Беларускі Аддзел узнавіў сваю працу*, "Голас беларуса" 1926, № 15 ад 4 жніўня, с. 2.

цалкам імкнецца да Рыгі і тут чакае знайсці задавальненне і абарону сваіх нацыянальных інтарэсаў"[103].

Латгальскія палітыкі выступалі супраць беларускіх школ. Яскрава сведчыць пра гэта факт, што ў 1922 г. дэпутаты латгальскіх партый у Сойме, абмяркоўваючы бюджэт, падтрымалі прапанову рускіх і польскіх дэпутатаў скасаваць фінансаванне беларускіх школ. У пазнейшы час латгальскія палітыкі не змянілі свайго меркавання. Нягледзячы на супраціў рускіх, польскіх і латгальскіх дэпутатаў, 27 ліпеня 1923 г. быў прыняты бюджэт, які прадугледжваў выдаткі на ўтрыманне беларускіх школ[104].

У 1923 г. адбылася вострая дыскусія паміж Ф. Кэмпсам і К. Езавітавым, прычынай якой была публікацыя першага *Пра латвійскіх "беларусаў"* у газеце "Jaunas Zinias". Аўтар сцвярджаў, што мясцовыя беларусы гэта "рускамоўныя каталікі-латгальцы", якія пад уплывам царскай палітыкі страцілі сваю мову і ідэнтычнасць. Больш за тое, у гэтым жа артыкуле аўтар назваў К. Езавітава рускім палітыканам, які ў свой час у Віцебску арганізоўваў чырвоныя палкі[105]. Дайшло да таго, што К. Езавітаў у судовым парадку абвінаваціў Ф. Кэмпса ў абразе. У выніку латгальскі палітык быў прызнаны вінаватым і асуджаны на два тыдні арышту, а Сойм пазбавіў яго дэпутацкага імунітэту[106]. Крытычны погляд на латвійскіх беларусаў падзяляў іншы латгальскі палітык Езупс Трасунс (*Jezups Trasuns*), які таксама неаднойчы непрыхільна выказваўся наконт мясцовага беларускага руху[107].

Падсумоўваючы, можна канстатаваць, што ў разгляданы час дзяржаўная палітыка ў дачыненні да беларусаў была часткай агульнай нацыянальнай палітычнай лініі латвійскай дзяржавы. У сувязі з высокім адсоткам нелатышоў, нацыянальнае пытанне з'яўлялася істотным элементам унутранай палітыкі Латвіі. Галоўныя прынцыпы нацыянальнай палітыкі вызначала дэмакратычнае заканадаўства краіны, якое было надзвычай ліберальнае да нелатышоў і давала ім шырокую культурную аўтаномію. У перыяд парламенцкай дэмакратыі палітыка ў адносінах нацменаў характарызавалася

---

[103] НАРБ,ф. 458, воп. 1, спр. 51, л. 17–19; LVVA, 2125 f., 5 ap., 104 l., 9–11 lpp.

[104] Э. Екабсонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [в:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 51.

[105] *Дэпутат Латвійскага Сойму Франц Кэмп атрымаў 2 тыдні турмы*, "Голас беларуса" 1925, № 16 ад 30 кастрычніка, с. 3; К. Казачёнок, *"Белорусский процесс" в Латвии: обвинение, оправдание, наказание*, "Латыши и беларусы: вместе сквозь века. Сборник научных статей", ред. М.Г.Королёв, Минск 2012, с. 34.

[106] К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, Рыга 1927 [перадрук: Нью-Ёрк – Менск 2013], с. 71.

[107] М. Голдманис, *"Белорусский" дискурс в латышской прессе (1920–1934): эволюция представления о белорусах как о самостоятельном национальном меншинстве*, "Латыши и белорусы: вместе сквозь века", Минск 2016, № 5, с. 70–72.

высокім узроўнем талерантнасці. Яе мэтай было дасягненне ўнутранай кансалідацыі грамадства, незалежна ад нацыянальнага паходжання, і стварэнне моцнай палітычнай нацыі[108].

З іншага боку, латвійскія ўлады разумелі патрэбу ўзмацнення латышскіх уплываў у шматнацыянальным грамадстве. Асабліва гэта тычылася самага стракатага ў нацыянальным сэнсе рэгіёну – Латгаліі. Нават праз дванаццаць гадоў незалежнасці колькасць прадстаўнікоў тытульнай нацыі ў правінцыі складала 56,9%, у тым ліку на Даўгаўпілшчыне – 54,8%, на Рэжыччыне – 62%, на Лудзеншчыне – 57,9%, на Абрэнаўшчыне – 53,1%. Улады ў Рызе добра ўсведамлялі патрэбу інтэграваць правінцыю з астатняй часткай краіны. У сувязі з гэтым найбольш прагматычная частка латвійскіх палітыкаў думала пра павелічэнне вагі латвійскага насельніцтва ў памежных рэгіёнах. Гэтай мэты можна было дасягнуць як палітычнымі, так і эканамічнымі сродкамі. Напрыклад, надзяляючы распарцэляванай у выніку аграрнай рэформы зямлёй латышоў і блакуючы набыццё яе прадстаўнікам нацыянальных меншасцей[109].

На стаўленне дзяржавы да нацменаў уплывалі такія фактары, як – гістарычная спадчына, дастаткова нізкі адсотак латышоў сярод паноўных сацыяльных груп, а таксама нежаданне раней прывілеяваных народаў (немцаў і рускіх) пагадзіцца з новай рэчаіснасцю ва ўмовах незалежнай Латвіі. Некаторыя нацмены (немцы, габрэі, палякі) мелі ўплывовых хаўруснікаў па-за межамі Латвіі, а іншыя (рускія) – моцныя эканамічныя эліты ўнутры краіны[110]. У гэтым кантэксце беларуская меншасць выглядала як найменш праблемная для маладой Латвійскай Рэспублікі. Аднак, як паказала гісторыя, тут таксама існавалі свае праблемы. У першую чаргу латвійскія ўлады непакоіў факт, што нацыянальна маласвядомае і эканамічна незаможнае беларускае насельніцтва падпадае пад уплывы радыкальных і дструктыўных сіл. Асабліва гэта тычылася камуністычнага руху, які з падтрымкай СССР праводзіў у краіне антыдзяржаўную працу. З прычыны геаграфічнай блізкасці да Савецкага Саюза Латвія знаходзілася пад асаблівай увагай крамлёўскай палітыкі. Апошняя па лініі Камінтэрну імкнулася да дэстабілізацыі суседа. З гэтай мэтай Масква не грэбавала выкарыстаннем нацыянальных і сацыяльна-эканамічных супярэчнасцей, якія існавалі ў латвійскім грамадстве. З аналізу палітычнай гісторыі міжваеннай Латвіі вынікае, што менавіта ў гаспадарча адсталай Латгаліі радыкальныя камуністычныя лозунгі мелі найбольшы шанец знайсці прыхільнікаў. Палітычнае ўпраўленне паліцыі Латвіі рэгулярна фіксавала праявы прасавецкіх і камуністычных настрояў у памежных з БССР, заселеных беларусамі рэгіёнах, пра што будзе гаворка

---

[108] *История Латвии XX век*, Д. Блейере, И. Бутулис, А. Зунда и др., Рига 2005, с. 201.

[109] LVVA, 1632 f., 2 apr., 493 l., 123–126 lpp.

[110] *История Латвии XX век*, Д. Блейере, И. Бутулис, А. Зунда и др., Рига 2005, с. 201.

пазней. У сувязі з гэтым пэўны ўзровень недаверу да беларусаў з боку дзяржавы, які заховаўваўся на працягу ўсяго існавання міжваеннай Латвіі, абгрунтаваны.

Стварэнне і дзейнасць першых беларускіх культурна-асветных таварыстваў

Першая беларуская культурна-асветная арганізацыя ў Латвіі ў мірны час была створаная ў Латгаліі. Яны з'явіліся дзякуючы К. Езавітаву, які пасля спынення дзейнасці ВДМ БНР са згоды ўраду В. Ластоўскага застаўся ў Латвіі дзеля працы сярод беларускай меншасці. Беларускі дзеяч разумеў палітычную кан'юнктуру і намеры латвійскага кіраўніцтва, але ведаў, што прыхільнасць улады у Рызе да беларусаў не гарантуе поспеху, таму лічыўся з тым, што напярадзе яго чакае вялікая арганізацыйная праца. У яго рапарце (12 жніўня 1921 г.) ў Раду народных міністраў БНР чытаем: "*Латвійскій Урад і грамадзянства ўжо добра паінфармаваныя ў нашых справах, добра разумеюць агульную небяспеку з боку Польшчы і начынаюць адносіцца да нас з лаяльнасцю і слядамі сімпатыі. Але гэта не азначае, што яны пыдыходзяць да яе сентыментальна-прыхільна, або будуць рабіць беларускую справу за нас. Мы павінны рабіць самі*"[111].

Трэба адзначыць, што К. Езавітаў разглядаў Латаглію як своесаблівы беларускі П'емонт падчас змагання за беларускую дзяржаўнасць. Яскрава сведчыць пра гэта вышэйзгаданы рапарт, у якім аўтар падкрэсліваў: "*Латгалію я лічу вельмі важным месцам для беларускай Справы, бо гэта мясцовасць цікава не толькі тым, што ў ёй, як нацыянальная меншасць, жывуць беларусы, праца над нацыянальным усведамленнем якіх ёсць наш святы абавязак, але яшчэ і таму, што гэта месца адначасна з'яўляецца: і апошняй фартэцыяй пальшчызны на Поўначы, у тыле нашай этнаграфічнай тэрыторыі, і ўспомагацельным фартом маскоўцаў, маючых тутака не толькі ўплывы, але і вельмі моцныя і рэальныя сілы ў асобе стараабрадчаства, і вельмі ўдобным і выгадным плацдармам для адбудоўкі беларускага П'емонта, з якога, як добрай батарэі, магчыма дапамагаць нашым ваякам на Бацькаўшчыне і абстрэльваць польскія і расейскія тылы*"[112]. Сродкам стварэння дадзенага беларускага П'емонту дзеяч лічыў атрыманне нацыянальна-культурнай аўтаноміі беларусаў у межах латвійскай дзяржавы. Былы кіраўнік ВДМ БНР бачыў магчымасць яе стварэння, рыхтуючы стратэгію будучай дзейнасці, пра што сведчаць наступныя словы: "*Прэтэнзій на гэту мясцовасць* [Латгалію – ЕГ], *ці на некаторыя яе часткі, Беларускі Урад, як я разумею,*

[111] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 56, л. 166.

[112] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 56, л. 167.

не мае бо да гэтага часу не апратэставаў сам і не даручаў мне апратэставаць Расейска-Латвійскую ўмову, устанаўліваючую межы Латвіі на ўсходзе. Умовы ж Латвіі і Расеі і Расеі і Польшчы ў свой час былі належным чынам апратэставаны. З гэтага вынікае, што беларуская праца ў Латгаліі можа ставіць сабе мэтай і кіравацца толькі да нацыянальнай аўтаноміі ў межах Латвіі. Нацыянальная аўтаномія, згодна Латвійскім законам, дае права на працу палітычную і культурна-прасветную. У справах культурна-прасветных першыя крокі ўжо зроблены і ў далейшым сваім развіцці павінны прывесці да стварэння Беларускага аддзелу пры Міністэрстве Прасветы і арганізацыі Беларускай школы і тэатру, а мо выдавецтва. У справах палітчных ідзе толькі падгатоўка да крокаў, якія павінны прывесці да стварэння Беларускай Нацыянальнай Сувязі ў Латгаліі, статут якой я ўжо выпрацоўваю, і да атрымання некалькіх месцаў у Парламенце Латвіі"[113].

Планам стварэння беларускай нацыянальна-культурнай аўтаноміі ў Латвіі спрыяў факт, што К. Езавітаў як ураджэнец Латгаліі меў магчымасць атрымаць латвійскае грамадзянства. З гэтай прычыны ён быў вымушаны адмовіцца ад грамадзянства БНР[114]. 30 лістапада 1921 г. К. Езавітаў стаў грамадзянінам Латвіі[115]. Такім чынам, беларускі дзеяч мог займацца стварэннем беларускіх грамадскіх структур у месцах кампактнага пражывання беларускага насельніцтва.

---

[113] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 56, л. 167–168.

[114] У рапарце на імя В. Ластоўскага былы кіраўнік ВДМ пісаў: "*Планы гэты і мая праца пад імі да гэтага часу перашкод з боку Латвійскага Ураду не спаткала. Магчыма, што і далей я змог бы, не змяняя сучаснага становішча адносін і спраў, вясці яе тым-жа парадкам. Але, пакуль рэч ідзе аб справах культурна-прасветных, дык ніякіх зменаў і не вымагаецца і ўсё ідзе добра. Калі ж пераходзімо да працы палітычнай, дык адразу паўстае пытанне фармальнага характару – аб грамадзянстве: або я павінен кіраваць усёй справай збоку, або павінен прыняць грамадзянства Латвіі. Права на Латвійскае грамадзянства я, як ураджэнец м. Дзвінска, –маю. Але з прыняццем ёю я, паперш-фармальна выхаджу з беларускай дзяржаўнай працы і грамадзянства, на другое – трачу званне Члена Рады Рэспублікі, па-трэцяе – пасады дэлегата міністэрства Міжнародовых Спраў (хоць з юрыдычнага боку гэта і не абавязкова), па-чацвёртае – буду напэўна мець шмат непрыемнасцяў, як для сябе, гэтак і для ўсіх беларусоў, – з маім палкоўніцкім чынам, якога латвійскі штаб можа і не прызнаць, бо не прызнае Ураду, даўшага мне гэты чын. Усё гэта, не кажучы ўжо аб настроях і пачуцце, мне вельмі цяжка і балюча. Але я бачу, што пакуль што, некаму ўзяцца за працу і, калі я не вазьмуся за яе, дык яна заглохне. І таму я, з болем і сумам, але адважваюся і на гэты крок і падаў уж от Ураду Беларусі просьбу аб дазваленні выйсці з грамадзянства Беларускай Народная Рэспублікі. Хай гэта будзе яшчэ адна ахвяра Беларускай Справе. Магчыма, што мясцовыя палякі зробяць са мной то-ж, што з пакойным Курловым, але і гэтага я не баюся, і не толькі не баюся, але лічыў-бы для сябе за вялікі гонар*". БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 56, л. 167–168.

[115] К. Езавітаў, *Кароткі жыцьцяпіс і праходжаньне службы* [у:] *Беларуская мэмуарыстыка на эміграцыі*, укл.: Л. Юрэвіч, Нью-Ёрк 1999, с. 191.

Галоўнай перашкодай на гэтым шляху быў нізкі ўзровень нацыянальнай свядомасці беларускамоўных жыхароў Латгаліі, чаму спрыяла нешматлікасць мясцовай беларускай інтэлігенцыі. Вось якім чынам пазней яе ацэньваў К. Езавітаў: "*Беларуская грамадскасць у Латвіі складалася ў 1921–1922 гг. з двух-трох свядомых беларускіх асветнікаў, якія ўжо раней прымалі актыўны ўдзел у беларускім руху, ды з даволі значнай і стойкай групы настаўнікаў-беларусаў, якія хаця-ж да гэтага часу і не бралі ўдзелу ў беларускай адраджэнчай працы, аднак па першым закліку шчыра ўсім сэрцам адгукнуліся і прынялі дужа чынны і актыўны ўдзелу як у стварэньні Т-ва 'Бацькаўшчына', гэтак і ў працы яго*"[116]. Тым часам, у лісце ўраду БНР ён пісаў: "*Сілы беларускія тутака ёсць, але яны вельмі абмаскалены і абпалячаны. Кідаць іх адных з паваду гэтага немагчыма. Ды і ініцыятывы ў іх няма для самастойнай працы. Патрэбны кіраўнікі. Захапленне беларускай нацыянальнай справы пачынае патроху ўлівацца ў душы і ўсё больш атрымліваю я лістоў, напісаных у беларускай мове*"[117]. Тым часам, іншы беларускі дзеяч Эдвард Будзька вось якім чынам бачыў сітуацыю і перспектывы працы ў Латвіі: "*Для працы тут прастор, бо народу беларускага многа кругом. Толькі бяда з цэнтрам: мала дзеячоў*"[118].

Асноўную групу мясцовых беларускіх інтэлігентаў складалі настаўнікі, якія да І сусветнай вайны прыбылі ў Латгалію з беларускіх губерняў. Менавіта з гэтымі людзьмі намагаўся ўсталяваць сувязі К. Езавітаў. У перыяд з сакавіка да жніўня 1921 г. ён наведаў Даўгаўпілс, Рэжыкнэ, Лудзу і Краславу, дзе прачытаў шэраг кароткіх публічных лекцый і адбыў 12 гутарак. Беларускі дзеяч узяў удзел у двух кангрэсах мясцовага настаўніцтва – у Даўгаўпілсе і Рэжыкнэ, падчас якіх раздаў інфармацыйную літаратуру і зладзіў некалькі сходаў з асобамі, зацікаўленымі беларускай справай. Мэтай гэтай актыўнасці быў пошук інтэлігентаў, што жадалі б далучыцца да арганізацыйнай працы беларускай меншасці. Плённым быў удзел К. Езавітава ў павятовым настаўніцкім кангрэсе ў Даўгаўпілсе, які адбыўся 20–21 сакавіка 1921 г. Вынікамі сваёй працы дзеяч спяшаўся падзяліцца з В. Ластоўскім. 23 сакавіка 1921 г. К. Езавітаў пісаў яму: "*Па маім даным мяне павінны былі цікавіць чалавек 15–20, якія ўжо паспелі зарэгістравацца як беларусы, але на месцы аказалася куды больш: каля 25–30 (...) З вялікай прыемнасцю заўважыў я, што хоць увесь кангрэс раз'ехаўся ноччу 21, усе беларусы затрымаліся яшчэ і 22, а некаторыя і 23 сакавіка. Пастанавілі залажыць 'Бацькаўшчыну', пры ёй вучыцельскі беларускі хаўрус і дамагацца стварэння курсаў беларусазнаўства для вучыцялёў, каб потым увосені мець магчымасць прыступіць да стварэння беларускай школы. Гутарыў*

[116] К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, Рыга 1927 [перадрук: Нью-Ёрк – Менск 2013], с. 98.
[117] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 56, л. 166.
[118] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1297.

у гэтай справе ўжо і з інспектарам, і з управай, і яны аднесліся зусім прыхільна. Мясцовыя вучыцялі прыйшлі апошнімі, але і сярод іх знайшліся мае старыя знаёмыя, якія таксама бяруцца за працу. Праз некалькі дзён раблю публічную лекцыю. Згоду на гэта атрымаў яшчэ ў Рызе ад Мін. Унутр. Спраў (...) Згода дадзена на радок лекцый у Дзвінску, Люцыну, Рэжыцы, Крэслаўцы і Іллюксту (...) На вялікую ўцеху сабе спаткаў некалькі сваіх былых вучаніц, якія цяперака ўжо вучыцелькамі. Яны вельмі дапамагаюць справе"[119].

Арганізацыйная праца патрабавала сродкаў і беларускамоўнай літаратуры. Кастусь Езавітаў разлічваў на дапамогу аднадумцаў па лініі БНР. У сувязі з гэтым ён прасіў В. Ластоўскага даслаць як мага больш прэсы, літаратуры і падручнікаў дзеля пашырэння сярод латгальскай інтэлігенцыі. У гэтай жа справе ён звяртаўся да кс. Адама Станкевіча і Клаўдзія Дуж-Душэўскага[120]. 26 сакавіка 1921 г. К. Езавітаў прасіў віленскіх дзеячаў дапамагчы знайсці двух лектараў, каб арганізаваць у Даўгаўпілсе курсы беларусазнаўства, а таксама даслаць падручнікі і бібліятэчкі на 15–20 школ, якія планаваў стварыць у латгальскай правінцыі. Пры гэтым ён прасіў не надаваць гэтай справе розгаласу, асцерагаючыся варожай рэакцыі з боку мясцовых польскіх дзеячаў[121].

Істотным момантам стала заснаванне першай беларускай арганізацыі ў Латгаліі. 25 сакавіка 1921 г. у Даўгаўпілсе ў кватэры Яна Харлапа на вуліцы Віцебскай 16 (*Vitebskas iela*) адбыўся сход ініцыятыўнай групы па стварэнні **Беларускага культурна-асветнага таварыства "Бацькаўшчына"**. Назва арганізацыі была невыпадковай. Заснавальнікі лічылі сваё таварыства працягам аднайменнай арганізацыі, якая дзейнічала ў 1917–1918 гг. у Менску, у 1918–1919 гг. – у Горадні, а потым у 1919–1920 гг. – у Рызе. Прысутныя выслухалі даклад К. Езавітава "Гісторыя беларускага адраджэнчага руху", пасля чаго зацвердзілі статут новай арганізацыі. Сярод заснавальнікаў былі: Ян Харлап, Кастусь Езавітаў, Іван Белікаў, Вольга Васільева, Пятро Дзяменцьеў, Мікалай Хмялеўскі, Якуб Кастылюк, Яўгенія Чапля, Марыя Сасноўская[122].

Гэтыя асобы падпісалі статут і 6 красавіка 1921 г. прадставілі яго Латгальскаму акруговаму суду. Апошні зацвердзіў дакумент 15 красавіка 1921 г. Першы

---

[119] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1053.

[120] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 19, л. 5–10.

[121] У лісце чытаем: "*Справы пасоўваюцца добра, але не хачу папярэджваць здарэнняў і таму – нічога не пішу. Прашу, вельмі прашу, толькі аб адным: спішыцеся з Вільняй, каб тамака былі гатовы прыслаць двух лектараў на курсы беларусазнаўства і падгатовілі падручнікаў і бібліятэчак на 15–20 школак. За ўсе гэты рэчы будзе заплачана. Паперяджваю, што разгалошваць і рэклямаваць гэту справу – шкодна, бо палякі павядуць чорт-ведае якую агітацыю і могуць спужаць гаспадароў*". АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1062–1063.

[122] К. Езавітаў, *Беларускае Культурна-Асьветнае Таварыства "Бацькаўшчына" ў Латгаліі і ягоная роля ў справе стварэньня беларускае школы ў Латвіі*, "Беларуская Школа ў Латвіі" 1932, № 1(11), с. 147.

склад цэнтральнай управы таварыства "Бацькаўшчына" быў наступны: Я. Харлап (старшыня: да сакавіка 1923 г.), К. Езавітаў (намеснік старшыні), М. Хмялеўскі (скарбнік), П. Паўчэр (сакратар), П. Дзяменцьеў (намеснік старшыні). Пасля таго, як два апошнія хутка пакінулі арганізацыю, іх месца занялі адпаведна – А. Васільеў і Эдвард Будзька. 17 верасня 1922 г. у Даўгаўпілсе адбыўся другі агульны сход сяброў таварыства "Бацькаўшчына", на якім была абраная новая ўправа, склад якой выглядаў наступным чынам: Іван Краскоўскі (старшыня), К. Езавітаў (намеснік старшыні), Паўліна Мядзёлка-Грыб (сакратар), Уладзімір Корці (скарбнік), Андрэй Якубецкі (намесніка скарбніка)[123].

Сядзіба цэнтральнай управы знаходзілася ў Даўгаўпілсе – у кватэры Я. Харлапа. Згодна са статутам, таварыства ставіла за мэту правядзенне ідэі беларускага нацыянальнага адраджэння ў беларускія і латышскія народныя масы праз выданне кніг, брашур і газет на беларускай, латышскай, літоўскай, рускай, нямецкай, польскай і ідыш мовах; спрыяць асвеце беларускага народа праз адкрыццё школ, чытальняў, бібліятэк, тэатраў, кніжных шапікаў, клубаў, а таксама дапамогу незаможным вучням і прадстаўнікам інтэлігенцыі[124].

Дзейнасць таварыства пашыралася на Латгалію. Адразу пасля рэгістрацыі кіраўніцтва таварыства пачало шукаць прыхільнікаў у правінцыі. Арганізацыя магла ствараць гурткі (філіялы), якія мелі за заданне пашыраць сярод беларускага насельніцтва нацыянальную культуру на роднай мове. Дэвізам гурткоў было: "Жыве мова – жыве народ"[125]. Кандыдатамі на ўступленне ў таварыства былі мясцовыя настаўнікі беларускага паходжання. Вось што пісаў К. Езавітаў да аднаго з вясковых педагогаў: "*Вам як беларусу трэба зрабіць вось што: 1) запісацца ў 'Беларускае Культурна-Прасветнае Т-ва "Бацькаўшчына' ў Латгаліі, якое са згоды Латвійскага Ураду ўтварылася ў Дзвінску і зацверджана 15.IV.21 Латгальскім Акружным Судом (...), 2) знесціся з вучыцелем Аўгусцінам Дварэцкім з дер. Лупанды Прыдруйскай воласці каб разам з ім (...) пашыраць літаратуру і прыўлякаць новых членаў у Таварыства, 3) заняцца нашай роднай мовай, 4) усюды агітаваць за беларускую школу, бо інакш беларусам пагражае паланізацыя і русіфікацыя, 5) падгатовіць пастаноўку ў Бальбінове беларускага спектаклю і, пастарацца ўгаварыць у Вашых ваколіцах і бацюшак, і ксяндзоў, і інтэлігенцыі, і сялянства, каб яны, будучы добрымі грамадзянамі Латвіі і падтрымліваючы Латвійскі Урад, не забываліся таго, што яны беларусы, цягнуліся да ўсяго роднага*"[126]. Зручнай нагодай да стварэння гурткоў на правінцыі быў удзел

---

[123] К. Езавітаў, *Беларускае Культурна-Асьветнае Т-ва "Бацькаўшчына" ў Латвіі*, Рыга 1932, с. 24–25.

[124] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 18, л. 4, 14.

[125] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 18, л. 4, 14.

[126] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 19, л. 15.

у з'ездах павятовага настаўніцтва. 23–25 красавіка 1921 г. у Рэжыкнэ адбыўся Латгальскі настаўніцкі кангрэс, на які кіраўніцтва таварыства "Бацькаўшчына" дэлегавала К. Езавітава[127]. У траўні 1921 г. К. Езавітаў выехаў у Лудзу, дзе пазнаёміўся з дырэктарам мясцовай гарадской гімназіі Сяргеем Сахаравым, якому прапанаваў стварыць у горадзе філіял таварыства "Бацькаўшчына". Апошні пагадзіўся склікаць сход мясцовай беларускай інтэлігенцыі, на якім К. Езавітаў расказаў пра галоўныя патрэбы і задачы беларускага руху. Мерапрыемства скончылася стварэннем філіяла таварыства ў Лудзы, у склад управы якога ўвайшлі: С. Сахараў (старшыня), настаяцель мясцовага праваслаўнага сабора а. Ніктапаліён Талоцкі (скарбнік) і настаўнік Міхал Іваноў (сакратар). Пасля ад'езду С. Сахарава з Лудзы кіраўнічыя абавязкі пераняў М. Іваноў[128]. Вось як пачаткі дзейнасці згадваў С. Сахараў: "*20 траўня 1921 г. у Люцын прыехаў тагачасны шэф беларускай місіі ў Рызе К.Б. Езавітаў. К.Б. Езавітаў азнаёміў мяне з планам-праектам арганізацыі культурна-асветнай працы сярод беларускага насельніцтва ў Латвіі (...) Праца адразу пайшла хуткім і дружным тэмпам: сябрамі праўлення (...) быў аб'езджаны ўвесь Лудзенскі павет, закладзены былі аддзелы т-ва*"[129].

Арганізацыйная праца на правінцыі ў 1921 г. прынесла пэўныя вынікі. Да канца года былі створаныя філіялы таварыства: улетку – у Лудзы, у кастрычніку – у Краславе, у лістападзе – у Старой Слабадзе (старшыня Максім Варажун, потым Астап Хруцкі). Апроч таго, існавалі філіялы ў Ізабэлінскай, Пустынскай і Прыдруйскай валасцях Даўгаўпілскага павета, а ў 1922 г. філіялы былі створаныя ва ўсходніх валасцях Лудзенскага павета (Зілупе, Брыгі, Рунданы, Ляўдары і інш.)[130]. Рабіліся спробы арганізацыйнай працы на Рэжыччыне. 15 студзеня 1923 г. Беларускі школьны аддзел звярнуўся да кіраўніцы прыватнай жаночай гімназіі ў Рэжыкнэ В. Сяўко з прапановай арганізаваць аддзел таварыства "Бацькаўшчына". Беларускі бок тлумачыў, якая карысць з гэтага можа быць (стыпендыі для моладзі на навучанне ў Пражскім універсітэце). Аднак дырэктарка адмовілася супрацоўнічаць з беларусамі[131].

Да дзейнасці таварыства "Бацькаўшчына" далучыліся прадстаўнікі "старой" дарэвалюцыйнай інтэлігенцыі, якая адчувала повязь з беларускімі каранямі.

---

[127] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 19, л. 17.

[128] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 110, л. 18.

[129] Д. Крэнт, *Матэрыялы Цэнтра даследаванняў старадрукаваных кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі як крыніца па гісторыі беларускага нацыянальна-культурнага жыцця ў Латвіі ў 1920–1930-ыя гг.*, "Латыши и беларусы: вместе сквозь века", Минск 2023, № 12, с. 117.

[130] Э. Екабсонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [в:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 52.

[131] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 45, л. 12; Тамсама, спр. 48, л. 2.

Разам з тым, актыўнасць арганізацыі паўплывала на нацыянальнае сталенне некаторых маладых латвійскіх беларусаў. Вось якім чынам сваю знаёмства з беларушчынай апісаў у лісце В. Ластоўскаму Алесь Сальцэвіч: "*З роднымі звычаямі, песнямі, байкамі, якія бачыў й чуў ад свайго дзеда, Міхала, пазнаёміўся /дужа/ рана; памятаю, як я 'сядзеў' вярхом на дзеду й як ён йграў мне на скрыпачцы родныя матывы, якія мне цяпер жыва ўстаюць па памяці. Цяпер часта я ўспамінаю дзеда й шкадую, што ён памёр, бо каб ён быў, то я шмат ад яго запісаў зрабіў бы; й песняў й баек ён ведаў бязлічнае мноства. За ягоную ігру на скрыпачцы яго паважалі й ведалі ўся Ілукшчына й Браслаўшчына, скуль ён паходзіў. Ён быў самародны паэта-кампазітар. Ад яго я ўпервыя чуў родную мову, з якой падчас смяяўся пад уплывам бацькоў. Бацькі мае, хоць і яўныя беларусы, але гэта не могуць зразумець. Мне шмат дасталося ад іх, а таксама й радні, за тое, што я крывіч, не хаваю свае крыўскае /беларускае/ паходжанне. З крыўскім /беларускім/ рухам упервыя азнаёміўся ў 1922 годзе, уступіўшы ў т-ва 'Бацькаўшчына'*"[132].

Асноўнай крыніцай утрымання таварыства "Бацькаўшчына" былі сяброўскія складкі, а таксама дзяржаўная дапамога. У снежні 1921 г. арганізацыя атрымала з Культурнага фонду Латвіі суму ў памеры 1 тыс. латвійскіх рублёў[133]. Таварыства "Бацькаўшчына" магло разлічваць на пэўнае фінансаванне з Міністэрства асветы. У 1922 г. па гэтай лініі было атрымана 50 тыс. рублёў, з Культурнага фонду Латвіі – 50 тыс. рублёў[134].

Паводле К. Езавітава, таварыства праводзіла працу ў трох асноўных напрамках: 1) пашырэнне ўплываў сярод латгальскіх беларусаў (праз арганізацыю рэгіянальных філіялаў) і аб'яднанне іх у нацыянальна свядомую частку грамадства, 2) інфармаванне латвійскіх улад і грамадства пра становішча беларускай меншасці і яе культурна-асветныя патрэбы, 3) арганізацыя беларускіх школ[135].

Адной з праяў нацыянальна-культурнай працы таварыства была тэатральная і музычная дзейнасць. У верасні 1921 г. К. Езавітаў пісаў А. Цвікевічу, што яму ўдалося стварыць пры таварыстве "Бацькаўшчына" тэатральную трупу з моладзі, якая паходзіла з Даўгаўпілса і навакольных вёсак[136]. Гэта былі слухачы першага набору настаўніцкіх курсаў беларусаведы. Працай трупы

---

[132] Цыт. паводле: А. Горны, *Алесь Сальцэвіч – невядомы дзеяч беларускай меншасці ў Латвіі ў міжваенны перыяд* [у:] *Гісторыя Беларусі ў XX стагоддзі. Памяці прафесара Івана Коўкеля*, рэд. А. Горны, Гродна 2017, с. 214.

[133] К. Езавітаў, *Беларускае Культурна-Асьветнае Т-ва 'Бацькаўшчына' ў Латвіі*, Рыга 1932, с. 22–23.

[134] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 2 lp.

[135] К. Езавітаў, *Беларускае Культурна-Асьветнае Т-ва 'Бацькаўшчына' ў Латвіі*, Рыга 1932, с. 5, 24.

[136] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1211.

кіраваў Сцяпан Заліўскі. 1 верасня 1921 г. у Даўгаўпілскім гарадскім клубе трупа паставіла першую п'есу. Гэта была камедыя Францішка Аляхновіча *На Антокалі*. Галоўныя ролі выканалі Сцяпан Заліўскі (Язэп) і Кацярына Сямёнава (Зоська). Той дзень К. Езавітаў лічыў народзінамі беларускага аматарскага тэатра ў Латвіі[137]. Трупу дапаўняў беларускі хор (кіраўнікі – Мікіта Сапега і Міхась Малько), які таксама ладзіў выступы[138]. Трупа і хор вандравалі з пастаноўкамі і канцэртамі па латгальскіх гарадах і вёсках. Яе ўдзельнікі ставілі спектаклі ў Даўгаўпілсе, Рэжыкнэ, Краславе і Бароўцы. Акрамя камедыі *На Антокалі* гралі такія пастаноўкі, як – *Паўлінка* Я. Купалы і *Манька* Ф. Аляхновіча. Аднак праз нястачу сродкаў і неабходнасць пастаянных раз'ездаў напрыканцы 1921 г. трупа спыніла існаванне[139]. На пачатку 1922 г. у Даўгаўпілсе па ініцыятыве Э. Будзькі і К. Езавітава была створана беларуская тэатральная трупа пад кіраўніцтвам Язэпа Камаржынскага. Яна ладзіла выступы ў Даўгаўпілсе – у клубе чыгуначнікаў, гарадскім клубе, клубе "Сауле", выязджалі ў латгальскія вёскі. Кастусь Езавітаў беспаспяхова намагаўся знайсці сродкі на ўтрыманне артыстаў[140]. Аднак восенню 1922 г. трупа падзяліла лёс папярэдніцы, спыніўшы дзейнасць. Яе ўдзельнікі, стрыжань якіх складалі слухачы настаўніцкіх курсаў, раз'ехаліся па хатах[141].

У сувязі з тым, што беларусы былі самай непісьменнай нацыянальнай групай у Латвіі, актыў таварыства "Бацькаўшчына" бачыў патрэбу весці пазашкольную асвету сярод беларускага сялянства Латгаліі. З мэтай распаўсюду беларускага друкаванага слова таварыства спрабавала стварыць у Даўгаўпілсе кнігарню[142]. Акрамя таго, у 1921 г. К. Езавітаў меў намер стварыць беларускі музей. Аднак праз адсутнасць дастатковай колькасці актывістаў і нястачу грошай магчымасці рэалізаваць статутныя мэты былі сціплыя[143]. Больш удала пайшла справа з арганізацыяй курсаў для дарослых. З плану 26-тыднёвых курсаў для дарослых, якія ладзіла таварыства "Бацькаўшчына" ў 1923/24 гг.

---

[137] Тэатрал, *Да пяцігодзьдзя Т-ва Беларускага Тэатру ў Латвіі*, "Беларуская Школа ў Латвіі" 1932, 1(11), с. 158.

[138] К. Езавітаў, *Беларускае Культурна-Асьветнае Т-ва 'Бацькаўшчына' ў Латвіі*, Рыга 1932, с. 10–12.

[139] LVVA, 1747 f., 1 apr., 25 l., 2 lp.; К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі,* Рыга 1927 [перадрук: Нью-Ёрк – Менск 2013, с. 61; Кастусёнак, *Беларускі Народны Тэатр у Рызе*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1928, № 8(1), с. 119.

[140] У красавіку 1922 г. К. Езавітаў пісаў да кіраўніка Беларускага школьнага аддзела: "*Т-ва 'Бацькаўшчына' паслала паперу аб Беларускім тэатру да Міністра Прасветы. Не адмоўце падтрымаць яе і дабіцца одпуску на пасобія, бо ўсе нацыянальнасці, апрача тас, ужэ дапамогі на тэатр даўно атрымалі*". LVVA, 2125 f., 5 apr., 38 l., 76 lp.

[141] Кастусёнак, *Беларускі Народны Тэатр у Рызе*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1928, № 8(1), с. 120.

[142] LVVA, 2125 f., 5 ap., 176 l., 85 lp.

[143] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1211.

у Лудзы, вынікае, што яны ўключалі заняткі па латышскай мове, гісторыі Латвіі, гісторыі Беларусі, беларускай мове, арыфметыцы і спевах[144].

Заслугоўваюць увагі намаганні кіраўніцтва таварыства "Бацькаўшчына" замацаваць на заканадаўчым узроўні юрыдычны статус беларускай нацыянальна-культурнай аўтаноміі. У лютым 1922 г. была прынятая Канстытуцыя Латвійскай Рэспублікі. Напярэдадні ў парламенце адбылася дыскусія, падчас якой дэпутаты ад нацыянальных меншасцяў намагаліся пашырыць нацыянальную аўтаномію за межы асветы. Гаворка ішла пра артыкул 116, які не толькі замацоўваў права нацменаў на экстэрытарыяльную культурную аўтаномію, але і прадугледжваў прыняцце асобнага закона, які б вызначыў спіс нацыянальнасцей, якія маглі карыстацца гэтым правам. Некаторыя латышскія палітыкі выказалі нязгоду, паколькі асцерагаліся стварэння "дзяржавы ў дзяржаве". 7 ліпеня 1923 г. Латвія ўнесла дэкларацыю аб правах нацыянальных меншасцей на разгляд Лігі нацый. Апошняя прызнала становішча нацменаў у краіне вельмі добрым[145]. На гэтай хвалі кіраўніцтва таварыства "Бацькаўшчына" ў ліпені 1923 г. падрыхтавала законапраект пра статус беларускай мовы, які прадугледжваў яе свабоднае выкарыстанне ў органах дзяржаўнай і мясцовай улады ў Латгаліі і на Ілукшчыне, а таксама магчымасць прамаўляць на ёй у Сойме[146].

Аднак справа не была скорай. Толькі 22 снежня 1923 г. К. Езавітаў прапанаваў беларускім актывістам унесці на разгляд Сойма праект нацыянальна-культурнай аўтаноміі для беларусаў. Каталізатарам сталі захады прадстаўнікоў іншых нацый, якія патрабавалі юрыдычнага замацавання іх аўтаноміі. К. Езавітаў пісаў, што "*У Сеймавых Камісіях разбіраюцца аўтаноміі жыдоўскай, нямецкай, расейскай, польскай ды др. нацыянальных меншасцяў. Да гэтага часу не выстаўлена праекту аб аўтаноміі Беларускай нацыянальнай меншасці. Калі такога праекту не будзе, дык магчыма, што мы зусім астанемся без закона аб аўтаноміі беларускай нацыянальнасці. Дужа прашу Вас запытаць праекты аб аўтаноміі ў ва ўсіх гэтых меншасцях, каб мы мелі магчымасць апрацаваць і срочна прадставіць свой праект*"[147]. У выніку было вырашана на падставе праекту нямецкай аўтаноміі распрацаваць адпаведны праект для беларусаў[148]. У абмеркаванні праекта ўзяў удзел К. Езавітаў, які ўласнаручна пазначыў на ім заўвагі. Дакумент утрымліваў згадку пра азначэнне прыналежнасці да беларускай меншасці ў Латвіі, рэгуляваў яе

---

[144] LVVA, 2125 f., 5 ap., 66 l., 114 lp.

[145] *История Латвии, XX век*, Д. Блейере, И. Бутулис, А. Зунда и др., Рига 2005, с. 148, 202–203.

[146] Э. Екабсонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах*, [в:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 52; LVVA, 2125 f., 5 ap., 251 l., 29 lp.

[147] LVVA, 2125 f., 5 ap., 73 l., 8 lp.

[148] LVVA, 2125 f., 5 ap., 73 l., 6 lp.

юрыдычны статус і прадугледжваў стварэнне беларускага самакіравання, якое мела магчымасць збіраць падаткі на нацыянальную працу. Справа, аднак, не мела працягу, бо дыскусія наконт пашырэння аўтаномій для нацыянальных меншасцей была спыненая на агульнадзяржаўным узроўні[149].

За прыкладам беларускіх латгальскіх актывістаў пайшлі іх рыжскія калегі. У снежні 1923 г. пачалося стварэнне беларускай грамадска-культурнай арганізацыі ў сталіцы Латвіі. 26 сакавіка 1924 г. Рыжскі суд зарэгістраваў статут **Беларускага культурна-прасветнага таварыства "Рунь"** *(Baltkrievu kulturizglītības biedrība "Ruņ")*[150]. Першым старшынём арганізацыі быў абраны Янка Шчорс. Да заснавальнікаў таварыства належалі: Аляксандр Родзька, Сяргей Сахараў, Ніна Пінская, Сцяпан Сіцька, Ян Тэтар, Пётр Шпакоўскі і Люцыя Клагіш (у замужжы – Тэтар). На момант рэгістрацыі ў таварыстве "Рунь" налічвалася 61 чал.[151] Першы сход кіраўніцтва арганізацыі адбыўся 6 красавіка 1924 г. Была абраная часовая рада ў складзе: Я. Шчорса (старшыня), А. Родзькі (намеснік), П. Шпакоўскага (скарбнік) і Н. Пінскай (сакратар). Кіраўніцтву было даручана парупіцца пра пашырэнне сярод рыжскіх беларусаў інфармацыі пра новую арганізацыю. Управа таксама пастанавіла звярнуцца ў Культурны фонд Латвіі па датацыю на дзейнасць[152].

Паводле сведчанняў кіраўніцтва, таварыства складалася з рабочых сталічных фабрык і заводаў, чыгуначнікаў і дробных службоўцаў[153]. Аналіз архіўных крыніц дазваляе прасачыць дынаміку папаўнення сяброўскіх шэрагаў. На другім пасяджэнні ўправы (1 траўня 1924 г.) у арганізацыю прынялі 12 новых сяброў[154]. На 3 траўня 1924 г. быў прызначаны ўсеагульны сход сябраў, на які з'явілася толькі палова, таму было вырашана яго адкласці[155]. На чарговым (4-м) пасяджэнні ўправы (28 траўня) у склад арганізацыі былі залічаны 22 новыя сябры, а на агульным сходзе сяброў (1 чэрвеня) – яшчэ 34[156]. Колькасць не ператваралася, аднак, у якасць, пра што сведчыць кепская арганізацыйная дысцыпліна значнай часткі сяброў. 21 снежня 1924 г. адбыўся чарговы агульны сход, але з'явілася толькі 28 чалавек, таму мерапрыемства было адкладзена на 11 студзеня 1925 г.[157]

Сядзіба арганізацыі знаходзілася ў арандаваным памяшканні па адрасе *Lāčplēša iela* 155, дзе была сцэна і буфет. Згодна са статутам, арганізацыя

---

[149] LVVA, 2125 f., 5 ap., 73 l., 11–13 lpp.
[150] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1005 l., 107 lp.
[151] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1005 l., 108 lp.
[152] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1007 l., 2–3 lpp.
[153] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1005 l., 75 lp.
[154] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1007 l., 3 lp.
[155] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1007 l., 4 lp.
[156] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1007 l., 5–7 lpp.
[157] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1007 l., 33 lp.

ставіла за мэту "*аб'яднаць беларускую нацыянальную меншасць у Латвіі, каб шляхом узаемнае працы і дапамогі пашыраць паміж сваіх сяброў і народа духоўнае развіццё і дзеля ўзаемнае культурнае, эканамічнае і юрыдычнае дапамогі*"[158]. Нягледзячы на тое, што арганізацыя лічылася агульналатвійскай, няма звестак пра яе дзейнасць па-за межамі сталіцы. Гэта дазваляе меркаваць, што праца абмяжоўвалася Рыгай. Арганізацыя мела права адчыняць школы і дзіцячыя садкі, ладзіць публічныя і закрытыя лекцыі, курсы, спектаклі і іншыя культурна-асветныя мерапрыемствы. Магла таксама ствараць хоры, аркестры, мастацкія і драматычныя гурткі; утрымліваць прытулкі, калоніі, майстэрні, народныя дамы, бібліятэкі, хаты-чытальні і музеі[159].

Ад сакавіка да траўня 1924 г. з дапамогай Міністэрства асветы таварыства "Рунь" зладзіла агульнаадукацыйныя курсы для дарослых, на якіх выкладалася, між іншым, латышская мова. Дзякуючы гэтаму курсу, двое беларусаў здалі іспыт па дзяржаўнай мове і захавалі свае пасады на пошце. Апрача таго, таварыства выйшла з ініцыятывай арганізацыі ў сталіцы беларускіх вячэрніх асветных курсаў для дарослых. 12 кастрычніка 1924 г. Міністэрства асветы зацвердзіла іх статут. На курсы запісалася 27 слухачоў, якія з сакавіка пачалі наведваць лекцыі латышскай мовы[160]. Мэтай ініцыятывы было даць пачатковую асвету непісьменным і ўдасканаліць веды тых, хто ўжо валодаў граматай[161].

Акрамя моўных і агульнаадукацыйных курсаў для дарослых таварыства ладзіла культурныя і асветныя мерапрыемствы: вечарыны, канцэрты, якія адначасова былі важнай крыніцай прыбытку арганізацыі. Напрыклад, 3 жніўня 1924 г. у Мірным садзе таварыства зладзіла беларускае гулянне і латарэю[162]. Гэта мерапрыемства так заахвоціла беларусаў, што яны планавалі 24 жніўня зладзіць яшчэ адно гулянне. Але не атрымалі дазволу гарадскіх улад[163]. У першы год існавання (1924/25 гг.) таварыства зладзіла 17 вечарын. У справаздачы арганізацыі за гэты час чытаем: "*Пры вельмі абмежаваных сілах і ўсякіх недахопах ставіліся магчымыя ў варунках цеснаты памяшкання і малога ліку асоб кароткія беларускія тэатральныя творы. Мэтаю пастановак было асаблівасцямі роднае мовы, матывамі песні, абразамі з жыцця родных і блізкіх закрануць душу рыжскага беларуса, напомініць яму аб яго далёкіх крэўных, абудзіць у ім свядомасць свае нацыянальнасці і падагрэць каханне да яе*"[164]. Сябрамі таварыства ставіліся такія спектаклі, як – камедыі

[158] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1004 l., 9 lp.
[159] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1004 l., 9 lp.
[160] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1007 l., 21 lp.
[161] LVVA, 2125 f., 5 ap., 11 l., 14 lp.
[162] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1007 l., 14 lp.
[163] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1007 l., 15 lp.
[164] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1004 l., 92 lp.

Модны шляхцюк Каруся Каганца, *Пасланец*, *Конскі партрэт* і *У кавалёвай хаце* Леапольда Родзевіча, *Стараста* Тараса Гушчы, а таксама шэраг твораў рускіх аўтараў. Цікава, што рэпертуар рыжскія беларусы атрымалі з БНК у Вільні, куды 8 снежня 1924 г. звярнулася кіраўніцтва таварыства "Рунь" з просьбай выбраць і даслаць тэксты найлепшых твораў. Акрамя таго, рыжане прасілі даслаць літаратуру пра беларускія народныя строі. У лісце адзначалася, што латышскія дзяўчаты любяць апранаць народныя строі, таму, беручы з іх прыклад, беларусы могуць зацікавіцца сваімі традыцыямі[165]. 11 лютага 1925 г. управа таварыства падтрымала прапанову старшыні зладзіць лекцыі і святкаванне гадавіны выдання Скарынавай Бібліі ("400-годдзе беларускага друку"). Паколькі дата прыпала на летнія вакацыі, было вырашана адкласці святкаванне на восень[166].

Напрыканцы 1924 г. у Рызе сфарміравалася ініцыятыўная група па стварэнні новай беларускай культурна-асветнай арганізацыі. Галоўным арганізатарам быў Мікалай Дзямідаў. Акрамя яго, у склад заснавальнікаў увайшлі Карл Каськевіч, Сцяпан Даргель, Міхась Краўчанка, Алена Васільева. Арганізацыя пачала працу 20 снежня 1924 г.[167] 30 снежня 1924 г. рыжскі суд зарэгістраваў статут **Рыжскага беларускага асветнага таварыства "Беларуская хата"** (*Rīgas Baltkrievu izglītības biedrība "Belaruskaja Chata"*)[168]. Першы сход сяброў адбыўся 15 лютага 1925 г., у ім узяло ўдзел 48 чал. Удзельнікі абралі кіраўніцтва: М. Дзямідаў (старшыня), К. Езавітаў (намеснік старшыні), Рыгор Плыгаўка (скарбнік), Язэп Станкевіч (сакратар) і С. Сіцько, Станіслаў Красневіч (сябры)[169].

Згодна са статутам, арганізацыя ставіла за мэту аб'яднаць беларускую меншасць у Рызе "*на здаровых культурна-нацыянальных падставах працы і руплцца аб найшчыльнейшым і таварыскім збліжэнні з латышскімі грамадскімі працаўнікамі, каб узгадаваць новае беларускае пакаленне ў духу кахання і прэданасці да Латвіі і латышскай культуры*"[170]. Таварыства мела на мэце пашыраць нацыянальную самасвядомасць беларускай меншасці, дапамагаць адраджэнню беларускай культуры, рупіцца пра культурна-грамадскую працу сярод рабочых, дбаць пра маральнае выхаванне беларускай моладзі, клапаціцца аб фізічным выхаванні. Арганізацыя магла арганізоўваць

---

[165] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1005 l., 75 lp.

[166] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1007 l., 39, 48 lpp.

[167] LVVA, 2125 f., 5 ap., 11 l., 20 lp.; М. Дзямідаў, *Справаздача аб чыннасьці Т-ва "Беларуская хата" за пяць год. 1924–1929*, "Голас беларуса" 1929, № 2 ад 22 ліпеня, с. 3.

[168] LVVA, 1632 f., 2 ap., 499 l., 3–4 lpp.

[169] LVVA, 2125 f., 5 ap., 11 l., 20 lp.; М. Дзямідаў, *Справаздача аб чыннасьці Т-ва "Беларуская хата" за пяць год. 1924–1929*, "Голас беларуса" 1929, № 2 ад 22 ліпеня, с. 3.

[170] *Статут Рыжскага беларускага прасветнага таварыства "Беларуская хата"*, [у:] *Крывіцкія руны. Вып. II: Беларускі культурны мацярык у Латвіі*, рэд. М. Казлоўскі, С. Панізнік, Менск 2017, с. 351.

прыродазнаўчыя, гістарычна-археалагічныя, этнаграфічныя, драматычныя, музычна-вакальныя, мастацкія і спартовыя гурткі; ствараць бібліятэкі, чытальні, школы, дзіцячыя садкі, прытулкі, курсы беларускай і латышскай моў, прафесійныя курсы, музеі, касы ўзаемнай дапамогі, настаўніцкія канферэнцыі і экскурсіі; ладзіць спектаклі, вечарыны, канцэрты і кінапаказы[171]. Таварыства мела права набываць нерухомасць[172].

Першапачаткова таварыства працавала на Маскоўскім Фарштаце, але з цягам часу пашырыла дзейнасць на іншыя раёны латвійскай сталіцы, дзе жылі рабочыя-беларусы. Спачатку сядзіба арганізацыі месцілася па адрасе *Tumes iela 2/1*. Кіраўніцтва мела намер адрамантаваць будынак і прыстасаваць яго да патрэбаў беларускіх культурна-асветных мерапрыемстваў. Але ў выніку арганізацыя мусіла перакінуць сваю дзейнасць у Саркандаўгаве. З 1 верасня 1925 г. яна пераехала ў будынак на вуліцы Сіманя (*Sīmaņa iela*) 14/16, арандаваўшы ў таварыства "Праваднік" 4-павярховую камяніцу, якая ў 1925–26 гг. была адрамантаваная намаганнямі таварыства[173]. Арганізацыя дзяліла будынак з іншымі беларускімі ўстановамі. На трэцім паверсе размяшчаліся беларускія настаўніцкія курсы, на другім – прыватная дадатковая школа для дарослых, а на першым – памяшканні пад найм. У сядзібе таварыства ладзіліся імпрэзы, фэсты і сустрэчы[174].

Захавалася няшмат звестак пра дзейнасць таварыства "Беларуская хата" ў першы год існавання. Можна меркаваць, што ў той час яно знаходзілася ў арганізацыйнай фазе. Сведчыць аб гэтым факт, што на 1 студзеня 1925 г. таварыства налічвала толькі 54 сяброў, але ў канцы года да арганізацыі належала ўжо 175 чал.[175] Яны ядналіся ў гуртках і філіялах у розных кутках Латвіі. У першыя месяцы існавання таварыства мела два рыжскія аддзелы – у Саркандаўгаве і Торнакалнсе (*Torņakalns*). Пасля ліквідацыі таварыства "Бацькаўшчына" было вырашана пашырыць дзейнасць на тэрыторыю Латгаліі. Улетку 1925 г. таварыства "Беларуская хата" адчыніла аддзелы ў Даўгаўпілсе і Лудзы[176]. Захаваліся звесткі наконт складу першай управы Даўгаўпілскага аддзела, у якую ўвайшлі: К. Антонаў, Андрэй Якубецкі, Канстанцін Александровіч, А. Райко[177].

---

[171] *Статут Рыжскага беларускага прасветнага таварыства "Беларуская хата"*, [у:] *Крывіцкія руны. Вып. II: Беларускі культурны мацярык у Латвіі*, рэд. М. Казлоўскі, С. Панізнік, Менск 2017, с. 351.

[172] LVVA, 1632 f., 2 apr., 492 l., 21 lp.

[173] LVVA, 2125 f., 5 ap., 11 l., 20 lp.

[174] *Беларускае жыцьцё ў Латвіі*, "Голас беларуса" 1926, № 1(19) ад 10 сакавіка, с. 3.

[175] М. Дзямідаў, *Справаздача аб чыннасьці Т-ва "Беларуская хата" за пяць год. 1924–1929*, "Голас беларуса" 1929, № 2 ад 22 ліпеня, с. 3.

[176] *Беларускае жыцьцё*, "Голас беларуса" 1925, № 2 ад 20 чэрвеня, с. 4.

[177] LVVA, 2750 f., 1 ap., 41 l., 10 lp.

Беларуская школьная справа: арганізацыя і дзейнасць

Сацыяльна-палітычныя ўмовы існавання беларускай школьнай справы

Натуральным прыярытэтам дзейнасці беларускага нацыянальнага актыву было стварэнне школ на роднай мове. Апошнія маглі існаваць у Латвіі на падставе адпаведнага заканадаўства, якое рэгулявала асветныя справы нацыянальных меншасцей. У сувязі з гэтым неабходна больш дэталёва прааналізаваць нацыянальную палітыку латвійскіх улад у галіне асветы. На падставе "Закона аб асветных установах Латвіі" ад 8 снежня 1919 г. навучанне з'яўлялася абавязковым для ўсіх латвійскіх грамадзян у веку ад 6 да 17 гадоў. Школьная адукацыя складалася з пачатковай (асноўнай) і сярэдняй. Існавалі два тыпы асноўных школ: 4-гадовыя першай ступені (класы I-IV) і 2-гадовыя другой ступені (класы V-VI). У адпаведнасці з артыкулам № 39 гэтага закона, адукацыйная палітыка ажыццяўлялася паводле прынцыпу нацыянальна-культурнай аўтаноміі. Згодна з ім, навучанне ва ўсіх адукацыйных установах (для моладзі да 16 гадоў) магло адбывацца на роднай мове вучняў. У снежні 1919 г. у Міністэрстве асветы быў створаны Дэпартамент нацыянальных меншасцей, у складзе якога існавалі школьныя аддзелы для самых шматлікіх нацыянальных меншасцей. Да ліку апошніх належалі: немцы, рускія, габрэі, палякі і беларусы. Ужо ў снежні 1919 г. пачалі працу тры першыя школьныя аддзелы: нямецкі, рускі і габрэйскі. У лютым 1921 г. з'явіўся Польскі школьны аддзел. З'яўленне гэтых аддзелаў сведчыла пра ініцыятыўнасць і актыўнасць мясцовай інтэлігенцыі згаданых нацыянальных груп. Акрамя школ, нелатышы маглі патрабаваць стварэння асобных класаў (камплектаў) у латышскіх школах. Камплект мог адчыніцца пры наяўнасці ў школе не менш як 30 вучняў пэўнай нацыянальнасці. Тым часам, школа магла быць адчынена пры наяўнасці не менш як 80 вучняў. У адпаведнасці з вышэйзгаданым законам (№ 40) нацыянальнасць вучняў вызначалася на падставе мовы, якой яны размаўлялі ў хаце. У школах нацыянальных меншасцей заняткі мусілі адбывацца на іх роднай мове, а таксама ўводзіўся прадмет па гэтай мове. Згодна з заканадаўствам, дзяржава і самакіраванне бралі на сябе абавязак утрымання школ для нацыянальных меншасцей. Памер фінансавання нелатышскіх школ залежаў ад колькасці кожнай нацыянальнай групы ў краіне.

Прынцыпы дзейнасці школ для нелатышоў акрэсліваў таксама "Закон аб школах нацыянальных меншасцей у Латвіі", у якім сцвярджалася, што дзеці нацменаў маглі наведваць школы той нацыянальнасці, да якой належалі іх бацькі. Роднай мовай вучня лічылася тая, якой ён мог свабодна выказваць свае думкі. Дадзены запіс быў, аднак, недакладны, бо не тлумачыў, якім чынам належыць верыфікаваць гэтыя веды. У выпадку мяшаных шлюбаў

нацыянальнасць дзіцяці вызначалася па лініі бацькі. Акрамя дзяржаўных школ, якія знаходзіліся на ўтрыманні мясцовага самакіравання, закон даваў магчымасць адчыняць прыватныя школы для нацыянальных меншасцей. Апошнія маглі ствараць і ўтрымліваць фізічныя або юрыдычныя суб'екты, якія звярталіся па дазвол да мясцовай школьнай управы. Асоба ці арганізацыя, якая жадала адчыніць школу, мела абавязак забяспечыць яе памяшканнем, інвентаром, навучальнай літаратурай і капіталам, памер якога вызначала школьная ўправа[178].

Рашэнне пра адкрыццё і закрыццё школ для нацыянальных меншасцей прымалі гарадскія і павятовыя школьныя ўправы, падкантрольныя Міністэрству асветы. Прапанову адкрыць школу мог рабіць нацыянальны школьны аддзел, які звяртаўся да мясцовай (павятовай, гарадской) школьнай управы. Апошняя цягам двух тыдняў магла накласці вета. Настаўнікаў прапаноўвала школьная рада, а зацвярджаў школьны аддзел. Апошні перадаваў спіс настаўнікаў мясцовай школьнай управе, якая таксама магла скарыстацца правам вета. Школьная ўправа займалася і звальненнем настаўнікаў. Пастанову школьнай управы можна было абскардзіць у Міністэрстве асветы[179].

Нагляд за працай школ нелатышоў ажыццяўляў міністр асветы праз адпаведныя нацыянальныя школьныя аддзелы Дэпартамента школ нацыянальных меншасцей. Кіраўнікоў гэтых аддзелаў зацвярджала Рада міністраў па прапанове дэпутатаў латвійскага парламента або грамадска-культурнай арганізацыі, якая прадстаўляла інтарэсы нацыянальнай групы. Кіраўнікі школьных аддзелаў лічыліся афіцыйнымі прадстаўнікамі сваёй нацыянальнасці ў культурных справах падчас зносін з урадам Латвіі. Яны кантактавалі з рознымі дэпартаментамі Міністэрства асветы ў справах, звязаных з сваёй нацыянальнай меншасцю. Больш за тое, кіраўнікі школьных аддзелаў мелі права прысутнічаць (з правам дарадчага голасу) на пасяджэннях Рады міністраў, на якіх разглядаліся пытанні, датычныя іх нацыянальнасці. Пры кожным нацыянальным школьным аддзеле існавала рада як кантрольна-адміністрацыйны орган. У яе склад уваходзілі: кіраўнік аддзела, рэферэнт ці школьны інспектар, тры прадстаўнікі нацыянальнай меншасці і тры прадстаўнікі настаўніцтва. Не радзей за чатыры разы на год адбываліся пасяджэнні рады. Справы, якія там разглядаліся, тычыліся адкрыцця, перафарміравання і закрыцця школ, прыёму і звальнення настаўнікаў ці іншых работнікаў[180].

Школы як дзяржаўныя, так і прыватныя падпарадкоўваліся дзяржаўнаму і грамадскаму кантролю. За выхаваўчы, арганізацыйны і навучальны працэс у мурах школы адказваў яе кіраўнік. Пра вынікі працы школы кіраўнік мусіў

---

[178] LVVA, 2125 f., 5 ap., 2 l., 56 lp.

[179] LVVA, 2125 f., 5 ap., 2 l., 56 lp.

[180] J. Albin, *Polski ruch narodowy na Łotwie w latach 1919–1940*, Wrocław 1994, s. 36.

дакладваць раз на два месяцы на пасяджэнні педагагічнай рады і раз на тры месяцы – на пасяджэнні школьнай рады. Агульны план працы школы на кожны навучальны год кіраўнік высылаў у свой нацыянальны школьны аддзел не пазней за 15 верасня, а падрабязны план (зацверджаны педагагічнай і школьнай радамі) – да 1 кастрычніка[181].

Заканадаўства ў галіне адукацыі для нацыянальных меншасцей не карысталася папулярнасцю сярод пэўнай часткі латышскай палітычнай эліты. У прэсе часамі ўздымалася пытанне пра мэтазгоднасць існавання нелатышскіх школ. Сярод прычын называлі нізкую якасць навучання і нязначную колькасць вучняў. Нягледзячы на гэта, школьная аўтаномія нацменаў у Латвіі захоўвалася, пакуль у краіне была дэмакратыя.

Фарміраванне сеткі беларускіх школ

Ствараючы сетку беларускіх школ, нацыянальны актыў кіраваўся вынікамі ўселатвійскага перапісу насельніцтва 1920 г. Апошні даваў беларускай меншасці падставы для адкрыцця школ у чатырох паветах: Даўгаўпілскім, Лудзенскім, Рэжыцкім і Ілукштанскім. У 1921 г. кіраўніцтва таварыства "Бацькаўшчына" падрыхтавала мемарыял пра становішча беларускай меншасці і яе школьныя патрэбы, які быў накіраваны Міністэрству асветы і Устаноўчаму сойму Латвіі[182]. Улетку 1921 г. мясцовыя аддзелы таварыства разгарнулі падрыхтоўку да арганізацыі школ. Першым крокам было збіранне звестак у мясцовасцях і валасцях, дзе пераважала беларускае насельніцтва. Кіраўнікам школ Латгаліі высылалі просьбы даць звесткі пра нацыянальнасць вучняў. На гэтай падставе потым можна было хадайнічаць пра ператварэнне школы ў беларускую[183]. Наступным этапам былі звароты таварыства "Бацькаўшчына" ў Даўгаўпілскую і Лудзенскую павятовыя школьныя ўправы з патрабаваннем стварыць беларускія школы ў мясцовасцях з перавагай беларускага насельніцтва. Першыя 16 беларускіх асноўных школ былі створаныя ў верасні 1921 г. у Пустынскай і Прыдруйскай валасцях Даўгаўпілскага павета[184]. Арганізацыйная праца ішла таксама на Лудзеншчыне. У лістападзе 1921 г. адбылося пасяджэнне Лудзенскай павятовай школьнай управы, на якой былі вызначаныя валасці з беларускім насельніцтвам (Істэрская, Ландскаронская, Янавольская, Рунданская, Міхайлаўская). Усе школы ў гэтых валасцях (акрамя латышскіх і часткова рускіх) напрыканцы 1921 г. былі ператвораныя ў беларускія[185].

---

[181] LVVA, 2125 f., 5 ap., 78 l., 53 lp.

[182] К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, Рыга 1927 [перадрук: Нью-Ёрк – Менск 2013], с. 59.

[183] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 47, л. 5.

[184] К. Езавітаў, *Беларускае Культурна-Асьветнае Т-ва "Бацькаўшчына" ў Латвіі*, Рыга 1932, с. 6–9.

[185] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 110, л. 12–13.

Да 1 студзеня 1922 г. было створана 48 беларускіх пачатковых школ, у тым ліку 17 – на Даўгаўпілшчыне і 31 – на Лудзеншчыне. Гэта складала 2,66% усіх пачатковых школ Латвіі. Беларускія школы наведвала 3 130 вучняў, якіх навучалі 99 настаўнікаў[186]. Вынік належыць лічыць добрым, калі ўзяць пад увагу, што ў гэты час у краіне дзейнічала 198 рускіх пачатковых школ[187], 73 нямецкія, 51 габрэйская, 28 польскіх[188], 6 літоўскіх і 6 эстонскіх[189]. У хуткім часе па колькасці асноўных школ беларусы апынуліся на трэцім месцы сярод нацыянальных меншасцяў: пасля рускіх і немцаў[190]. Большасць школ складалі 4-гадовыя ўстановы першай ступені. На працягу двух першых гадоў колькасць беларускіх пачатковых школ расла. Восенню 1922 г. існавалі ўжо тры беларускія сярэднія школы, 48 пачатковых, у тым ліку некалькі камплектаў[191]. У гэты час былі адчынены тры сярэднія школы – у Даўгаўпілсе, Лудзы і Краславе, дзве пачатковыя – у Даўгаўпілсе і Краславе і тры камплекты (у Мала-Індрыцкай, Круманаўскай і Ліўчанскай школах)[192]. У справаздачы кіраўніка Беларускага школьнага аддзела напрыканцы 1923 г. адзначалася: "*З новых школ у бягучым вучэбным годзе адчынены ў м. Дзвінску, Краслаўцы, у вёсцы Ліўчаны Ізабелінскае гміны і ў сяле Брадайжэ Рунданскае гміны Люцынскага павета. Усяго ў беспасярэднім кіраўніцтве Беларускага Упраўлення ў цяперашні час знаходзіцца 43 пачатковыя школкі і 6 у сферы ўплыву Беларускага Упраўлення, якія састаяць у кіраўніцтве Школьнага Дэпартамента. Апрыч таго дазволена к адчыненню беларускія школы ў м. Рызе, на якую Рыжскім мястовым Самаўпраўленнем адпушчана пакуль 400.000 руб.*"[193].

Натхнёны плёнам арганізацыйнай працы ў першыя гады беларускай школьнай аўтаноміі, К. Езавітаў пісаў: "*Зразумела, вельмі цяжка адразу перамагчы ўсё тое, што было прышчэплена беларусам сотнямі гадоў русіфікацыі і паланізацыі, але па тых рэзультатах, якія дасягнуты за адзін год працы, відаць, як шпарка прачынаецца народная самасвядомасць, і трэба спадзявацца, што праз 3–5 гадоў нацыянальная самасвядомасць беларускай меншасці ў Латвіі дойдзе да такой ступені, на якой зусім не знойдзецца месца ніякім*

---

[186] *Latvijas statistikas gada grāmata 1921*, Rīga 1922, s. 54.

[187] Большасць рускіх школы знаходзілася ў Латгаліі – 140, у тым ліку 51 на Даўгаўпілшчыне, 44 на Рэжыччыне, 45 на Лудзеншчыне.

[188] Палова польскіх школ (14) існавала ў Латгаліі: 9 на Даўгаўпілшчыне, 2 на Рэжыччыне, 3 на Лудзеншчыне.

[189] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 110, л. 1–1 зв.; *Latvijas statistikas gada grāmata 1921*, Rīga 1922, s. 53.

[190] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 47, л. 5.

[191] LVVA, 2125 f., 5 ap., 333 l., 60–64 lpp.; Пар.: К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, Рыга 1927 [перадрук: Нью-Ёрк – Менск 2013, с. 73–79.

[192] LVVA, 2125 f., 5 ap., 333 l., 61 lp.

[193] LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 67 lp.

застрашванням і чуткам"[194]. Ён лічыў, што сетку беларускіх школ належыць разбудоўваць, павялічыўшы іх колькасць прынамсі ўдвая. Дзеяч даводзіў, што адна беларуская асноўная школа прыпадала на 1 324 вучняў-беларусаў, што было адным з найгоршых вынікаў у параўнанні з іншымі нацыянальнымі групамі. Ён сцвярджаў, што ў латышоў адна школа прыпадала на 850 чал., у рускіх – на 462, у немцаў – на 796[195]. Аднак свае падлікі беларускі дзеяч грунтаваў на неаб'ектыўных выніках перапісу 1920 г. Больш аб'ектыўным было кіраўніцтва Беларускага школьнага аддзела, якое лічыла, што ў 1922/23 гг. адна школа прыпадала на 1 249 вучняў-беларусаў. У рускіх была адна школа на 462, у немцаў – 796 і ў латышоў – 850[196]. Калі ўзяць пад увагу вынікі перапісу 1925 г., можна лічыць, што адна беларуская школа прыпадала на 1 226 вучняў. Найлепшы вынік мелі рускія (адна школа на 780 чал.), латышы (960) і габрэі (1 190), а найгоршы – палякі (1 504).

Нягледзячы на аптымізм беларускага актыву, ад 1923 г. колькасць беларускіх школ сістэматычна змяншалася. Сведчыць пра гэта дадзеная табліца.

Табліца 18. Колькасць беларускіх школ у 1921–1925 гг.

	1921/22	**1922/23**	**1923/24**	**1924/25**
Сярэднія школы				
Даўгаўпілскі павет	0	2	1	1
Лудзенскі павет	0	1	1	1
Разам	0	3	2	2
Пачатковыя школы				
Даўгаўпілскі павет	17	17	15	12
Лудзенскі павет	31	28	23	20
Рыга	0	0	1	2
Разам	48	45	39	34
Камплекты				
Даўгаўпілскі павет	0	3	3	4
Лудзенскі павет	0	0	0	0
Разам	0	3	3	4
Сума пачатковых школ	48	48	42	38

Апрацаванне аўтара на падставе: LVVA, 2125 f., 5 ap., 333 l., 60–64 lpp.; LVVA, 2125 f., 5 ap., 15 l., 15 lp.; LVVA, 2125 f., 5 ap., 259 l. 17–24 lpp.

Пад уплывам зменаў колькасці беларускіх школ мянялася лічба настаўнікаў і вучняў. У разгледжаны час у беларускіх школах працавала ад 83 да 106 педагогаў, якія навучалі ад 2 390 да 3 278 вучняў.

[194] К. Езавітаў, *Становішча беларускае школы ў Латвіі*, Вільня 1923, с. 23.

[195] К. Езавітаў, *Становішча беларускае школы ў Латвіі*, Вільня 1923, с. 24–25.

[196] LVVA, 2125 f., 5 apr., 106 l., 1 lp.

Табліца 19. Колькасць настаўнікаў і вучняў беларускіх школах у Латвіі ў 1921–1925 г.

	1921/22		1922/23		1923/24		1924/25	
	Наст.	Вучні	Наст.	Вучні	Наст.	Вучні	Наст.	Вучні
Разам	99	3 130	106	3 278	100	2 901	83	2 390

Крыніца: LVVA, 2125 f., 5 ap., 333 l., 57 lp.

Хуткае стварэнне сеткі беларускіх пачатковых школ у Латгаліі ў значнай ступені з'яўлялася вынікам працы К. Езавітава. Ён пераехаў з Рыгі ў Даўгаўпілс, адкуль часта выязджаў у латгальскія вёскі з мэтай арганізацыі беларускай школьнай справы. Дзеяч асабіста аб'язджаў мясцовасці з беларускамоўным насельніцтвам і пераконваў бацькоў падаваць заявы пра ператварэнне школ у беларускія. Гэтыя заявы К. Езавітаў перадаваў павятовым школьным управам у Даўгаўпілсе і Лудзы[197].

Геаграфія беларускіх школ адпавядала кампактнаму пражыванню беларускамоўнага насельніцтва – на Даўгаўпілшчыне і Лудзеншчыне. Беларускі актыў планаваў ахапіць школьнай акцыяй таксама Ілукштанскі і Рэжыцкі паветы. У рускіх школах на Ілукшчыне вучылася пэўная колькасць беларусаў. Іх прысутнасць была заўважаная ў 8 школах (Фабіянаўскай – 42, Дзерванішскай – 48, Элернскай – 66, Прыстанскай – 74 і г.д.)[198]. Частка кіраўнікоў гэтых школ прыхільна ставілася да ператварэння школ у беларускія[199]. У снежні 1921 г. С. Сахараў раіў К. Езавітаву наведаць Ілукшчыну, каб дамагчыся там арганізацыі беларускіх школ[200]. У чэрвені 1922 г. С. Сахараў інфармаваў К. Езавітава, што самакіраванне мясцовасці Грыва не супраць стварэння беларускай школы. У сувязі з тым ён прапанаваў камандзіраваць туды А. Якубецкага або іншага дзеяча[201]. На пасяджэнні Рады Беларускага школьнага аддзела 15 ліпеня 1922 г. С. Сахараў адзначаў, што зараз, калі створаныя беларускія школы на Даўгаўпілшчыне і Лудзеншчыне, неабходна засяродзіцца на школьнай арганізацыі на Рэжыччыне

---

[197] LVVA, 2125 f., 5 ap., 38 l., 132, 136, 137, 140 lpp.

[198] LVVA, 2125 f., 5 ap., 69 l., 55 lp.

[199] LVVA, 2125 f., 5 ap., 55 l., 8 lp.

[200] У лісце чытаем: "*Да гэтага часу Ілукстская павятовая школьная Управа не прыслала спіска беларускіх школак у павеце. З прыкладаемага к гэтай паперы яе ліста (...) ад 29 снежня 1921 г. відаць, што ў гэтым павеце перамагаюць польскія тэндэнцыі. Па такой прычыне Беларускі Аддзел шчыра просіць Вас паехаць на 7 чысло гэтага студзеня месяца ў Грыву на пасяджэнне Ілукстскае павятовае школьнае Управы і зрабіць там патрэбнае тлумачэнне аб сучаснай справе. З папер Рускага Аддзелу відаць, што там ужо ёсць дзве школы, каторыя павінны быць беларускімі: гэта – Бельмонтаўская (обучается 29 беларусаў) і Скрудалінская (обуч. 56 бел.). Мабыць, што найдуцца і др. школы. Сваё тлумачэнне грунтуйце на статыстычных асновах*". LVVA, 2125 f., 5 ap., 69 l., 2–3 lp.

[201] LVVA, 2125 f., 5 ap., 69 l., 60 lp.

і Ілукшчыне[202]. Аднак, нягледзячы на гэтыя дэкларацыі, справа ў Ілукштанскім павеце не зрушылася з месца. У лістападзе 1922 г. Беларускі школьны аддзел звяртаў увагу Ілукштанскай павятовай школьнай управы і тамтэйшага інспектара пачатковых школ на тое, што ў павеце па-ранейшаму няма беларускіх школ[203]. 27 лістапада 1923 г. К. Езавітаў лічыў, што неабходна звярнуць увагу на чатыры школы на Ілукшчыне, якія магчыма беларусізаваць, паколькі імі кіруюць настаўнікі-беларусы. Адначасова дзеяч адзначаў, што там пануюць рускія і польскія ўплывы, таму поспехам будзе, калі ўдасца стварыць беларускія камплекты[204]. У выніку беларусам удалося стварыць у некаторых валасцях Ілукшчыны (Дземанская, Каплаўская, Сіленская і інш.) беларускія камплекты пры 14 мяшаных школах, але навучанне ў іх адбывалася на рускай мове[205].

Падобная сітуацыя была ў Рэжыцкім павеце. З назіранняў беларускага актыву вынікала, што вучні-беларусы былі ў 7 рускіх школах Рэжыччыны (найбольш іх было ў Кюкаўскай – 54 і Папоўскай – 51). Аднак Рэжыцкая павятовая школьная ўправа працяглы час байкатавала пытанні беларускіх дзеячаў пра нацыянальны склад вучняў мясцовых школ. Нарэшце, 10 сакавіка 1922 г. з Рэжыкнэ быў атрыманы адказ, што ўправа не мае спецыялістаў, каб вызначыць нацыянальнасць навучэнцаў. У адказ беларускі бок прасіў правесці сярод мясцовага насельніцтва апытанне наконт магчымасці ператварэння некаторых школ з рускіх і польскіх – у беларускія. Паводле звестак беларускіх дзеячаў, у павеце былі прынамсі тры школы, дзе беларусы складалі значны адсотак вучняў[206]. 10 сакавіка 1922 г. Рэжыцкая школьная павятовая ўправа інфармавала, што не можа вызначыць нацыянальны склад вучняў і прасіла беларусаў адкамандзіраваць дзеля гэтага ў павет свайго прадстаўніка[207]. 16 сакавіка 1922 г. кіраўніцтва Беларускага школьнага аддзела даручыла К. Езавітаву перамовы з Рэжыцкай школьнай павятовай управай наконт стварэння беларускіх школ[208]. У ліпені 1922 г. К. Езавітаў рабіў захады, каб беларусізаваць некаторыя школы ў Рэжыцкім павеце. 10 ліпеня ён наведаў Рэжыкнэ і правёў у школьную раду пастанову пра беларусізацыю Панаўскай і Дабрачынскай школ (Вайводаўская воласць)[209]. Беларускі школьны аддзел накіраваў ліст дырэктару адной з іх (Панаўскай) з прапановай ператварыць школу ў беларускую. У лісце падкрэслівалася, што змена

---

[202] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 1–5 lpp.

[203] LVVA, 2125 f., 5 ap., 48 l., 17, 18 lpp.

[204] LVVA, f. 2125, 5 apr., 256 l., 61 lp.

[205] У. Пігулеўскі, *Беларускі Аддзел пры Міністэрстве Асьветы ў Латвіі за 10 год працы* [у:] *Дзесяць год Беларускае Школы ў Латвіі 1921–1931*, Рыга 1932, с. 32.

[206] LVVA, 2125 f., 5 ap., 39 l., 24 lp.

[207] LVVA, 2125 f., 5 ap., 55 l., 3 lp.

[208] LVVA, 2125 f., 5 ap., 146 l., 1 lp.; LVVA, 2125 f., 5 ap., 40 l., 30 lp.

[209] LVVA, f. 2125, apr. 5, l. 261, 95 lp.

нацыянальнай юрысдыкцыі будзе азначаць увядзенне дадатковых прадметаў па гісторыі і геаграфіі Беларусі з захаваннем вывучэння іншых прадметаў на рускай мове[210]. Нягледзячы на захады беларускага актыву, на Рэжыччыне не ўдалося стварыць ніводнай беларускай школы або камплекту[211].

Беларуская школьная дзейнасць ахапіла таксама Рыгу. Сталічны беларускі актыў намагаўся не адставаць ад латгальскіх пабрацімаў. У снежні 1921 г. рыжскія беларусы ўзнялі пытанне пра адкрыццё нацыянальнай школы ў Рызе, падрыхтаваўшы адпаведны зварот у Рыжскую гарадскую школьную ўправу. Апошняя, аднак, адмовілася прызначыць адпаведны грашовы крэдыт на ўтрыманне школы. Паводле падлікаў аўтараў звароту, у Рызе налічвалася каля 800 беларускіх дзетак, якія наведвалі рускія і польскія школы або з прычыны незаможнасці былі пазбаўленыя асветы. Нягледзячы на адмову гарадскіх улад, беларускі бок у наступныя месяцы не перастаў патрабаваць адкрыцця школы з двума настаўнікамі[212]. На пасаду кіраўніка беларусы прапанавалі кандыдатуры Я. Шчорса і Р. Плыгаўкі. Адначасова беларускі бок прасіў увесці ў склад Рыжскай гарадской школьнай управы прадстаўніка беларускай школы, які б удзельнічаў у вырашэнні пытанняў, звязаных з беларускай меншасцю ў Рызе[213].

Увесну 1923 г. рыжскае гарадское самакіраванне з падтрымкай старшыні школьнай управы і асветнай камісіі Робертса Берзіньша (*Roberts Bērziņš*) уключыла ў бюджэт сродкі ў памеры 8 тыс. латаў на ўтрыманне адной беларускай школы. Рэгістрацыяй вучняў-беларусаў заняліся Я Шчорс і М. Дзямідаў. Апошні дзеля гэтага быў выкліканы з Пустыні[214]. Арганізатары школы выдалі адозву на рускай мове "Граждане-белоруссы г. Риги", у якой чытаем: "*Многие из Вас в поисках заработка переселились в Ригу с своей Белоруссии, т.е. с бывших Витебской, Могилевской, Минской, Виленской, Ковенской и Гродненской губерний; Ваши дети обучались до сего времени в школах других национальностей, а может быть многие и совсем не обучались, вследствии бедности и других обстоятельств. Теперь Городская Школьная Управа дает Вам свою родную школу, где не только научат Ваших детей всему тому, что нужно знать каждому человеку, но и познакомят их с родной историей, с родной географией, они услышат здесь звуки своей заунывшей белорусской песни и свой родной язык. Граждане-белоруссы, без различия исповедания, и православные, и католики! Спешите отдать своих детей в белорусскую*

---

[210] LVVA, 2125 f., 5 ap., 39 l., 39 lp.

[211] У. Пігулеўскі, *Беларускі Аддзел пры Міністэрстве Асьветы ў Латвіі за 10 год працы* [у:] *Дзесяць год Беларускае Школы ў Латвіі 1921–1931*, Рыга 1932, с. 32.

[212] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 45, л. 13.

[213] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 45, л. 16–17.

[214] С. Сіцько, *Дзесяцігодзьдзе 1-ае Рыжскае беларускае аснаўное школы, 1923–1933,* Рыга 1934, с. 9.

школу!"[215]. За кароткі час у пяць класаў (у тым ліку падрыхтоўчы) было залічана 159 вучняў. 19 жніўня 1923 г. быў скліканы першы бацькоўскі сход, на які з'явілася 49 чал. Удзельнікі абралі школьную раду ў складзе: П. Шпакоўскага (старшыні) М. Ліпгарт, М. Дзямідава, Я. Яхімовіча і М. Навіцкага. Рада абрала кіраўніком школы М. Дзямідава, а настаўнікамі Алену Высокіх (1 кастрычніка яе замяніў С. Сіцько) і Вольгу Гайліт. 3 верасня 1923 г. школа адчынілася. 25 верасня 1923 г. на працу былі прынятыя настаўнікі Я. Шчорс і А. Родзька, а 15 кастрычніка да іх далучылася М. Ліпгарт[216].

Першапачаткова школа месцілася ў у будынку на вуліцы Маскоўскай 140б (*Maskavas iela*), але потым пераехала ў будынак № 173 на гэтай жа вуліцы, дзе заняла два паверхі. 15 верасня 1923 г. кіраўнік школы звярнуўся ў Міністэрства асветы з просьбай пра матэрыяльную дапамогу. Ён сцвярджаў, што школа патрабуе асаблівай увагі, бо з'яўляецца аб'ектам варожасці рускага настаўніцтва, якое намагаецца адцягнуць беларускіх вучняў у свае школы[217]. 21 кастрычніка 1923 г. педагагічная рада школы прасіла дапамагчы ў арганізацыі залы, прызначанай на ўрачыстасці[218]. 23 кастрычніка 1923 г. М. Дзямідаў атрымаў 3 тыс. рублёў авансу на дзейнасць школы[219].

19 студзеня 1924 г. М. Дзямідаў адмовіўся ад пасады кіраўніка школы, а яго месца заняў П. Стак, які 10 траўня быў зацверджаны школьнай радай часовым кіраўніком школы. У рэшце рэшт кіраўніком стаў С. Сіцько. У 1923/24 гг. працу ў школе пачалі: Ян Дзегузе (спевы), а. Мікалай Македонскі (праваслаўны катэхет) і кс. Антон Альшэўскі (каталіцкі катэхет). У 1924/25 гг. школа пачала працаваць у 4-класным складзе (падрыхтоўчы налічваў 31 вучняў, I – 33, II – 36, III – 30). Разам з павелічэннем колькасці класаў вырасла і колькасць настаўнікаў. 30 верасня 1924 г. школьная рада прыняла на працу Люцыю Клагіш[220]. Першы выпуск у школе адбыўся ўлетку 1925 г., калі школьныя муры пакінулі: Васіль Апанасёнак, Васіль Касілякін, Уладзімір Кінэп, Пятро Плотнікаў, Аляксандр Трэй, Алена Шаблоўская[221]. У 1924/25 гг. у школе працавала 8 настаўнікаў і навучалася 170 вучняў[222].

---

[215] LVVA, 2125 f., 5 ap., 210 l., 1 lp.

[216] С. Сіцько, *Дзесяцігодзьдзе 1-ае Рыжскае беларускае аснаўное школы, 1923–1933*, Рыга 1934, с. 10.

[217] LVVA, 2125 f., 5 ap., 61 l., 1 lp.

[218] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 111, л. 8–9.

[219] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 46, л. 15.

[220] *З Латвіі,* "Крывіч" 1923, № 3, с. 62; К. Езавітаў, *Дзесяцігодзьдзе 1-е Беларускае школы у Рызе*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 6(23), с. 837.

[221] С. Сіцько, *Дзесяцігодзьдзе 1-ае Рыжскае беларускае аснаўное школы, 1923–1933*, Рыга 1934, с. 11. Паводле іншых звестак школу тады скончыла 8 вучняў (*Беларускае жыцьцё*, "Голас беларуса" 1925, № 2 ад 20 чэрвеня, с. 4).

[222] LVVA, 2125 f., 5 ap., 259 l. 1–4 lpp.

Трэба падкрэсліць, што ў большасці выпадкаў (не лічачы сталічных школ) арганізацыя беларускіх навучальных устаноў адбывалася шляхам ператварэння ў беларускія ўжо дзейных школ з рускай ці польскай мовамі навучання. Заклікаючы школьных дырэктараў спрыяць ператварэнню іх школ у беларускія, дзеячы нацыянальнага руху карысталіся як гістарычнымі і статыстычнымі аргументамі, так і патрыятычнай рыторыкай. У прыватнасці, у лісце кіраўніцтва Беларускага школьнага аддзела дырэктару Дэгелеўскай школы (6 снежня 1921 г.) чытаем: "*На Ваше отношение от 6.XII.21 за № 41 Белорусский Отдел просит Вас дополнительно сообщить, какие данные (исторические и этнографические) положены Вами в основу Вашего ответа о национальном составе учащихся, когда всех учащихся причислили к великоруссам. Между тем даже по официальной переписи 1920 г. в Латвии, в Михайловской волости, насчитывается белоруссов 24,36% общего количества населения. Где же эти белоруссы? Далее и исторические, и этнографические данные говорят, что Михайловская волость находившаяся в составе б. Витебской губ., всегда причислялась к Белоруссии. Поэтому Белорусский Отдел полагает, что такой принципиальный вопрос нельзя единолично решать, руководствуясь теми или иными взглядами на белорусское возрождение, а просит Вас созвать общее родительское собрание, подробно разъяснить родителям, кто такие белоруссы, где они живут. Белорусский Отдел просит Вас дополнинельно сообщить ему о национальном составе учащихся, для чего Вы должны созвать общее родительское собрание, подробно разъяснить родителям, кто такие белоруссы, где они живут, каков их исторический путь, какие задачи их текущего момента и затем предложить им вопрос, к какой национальности они причисляют себя – белорусской или великорусской и желают ли они, чтобы Гольшевская школа переименовалась в белорусскую и перешла в ведение Белорусского Отдела. Для ознакомления с белорусским вопросом Вам прилагаеться для школьной библиотеки книга д-ра Цвикевича 'Белорусь' (...) При этом Белорусский Отдел просит Вас доложить общему собранию родителей, что: 1) организация белоруссов в настоящее время необходима, когда все остальные национальности уже сплотились; 2) Латвийское Правительство идет навстречу белоруссам, предоставляя им культурную автономию и отпускает значительные кредиты на школы, курсы для взрослых и т.п.; 3) При переходе в Белорусский Отдел школы сохраняют свой прежний строй; главное изменение будет то, что в программу вводится знакомство с историей и географией Белоруссии; 4) Кажая национальность в Латвии имеет свои школы; белоруссам тоже дана своя школа и только несознательные белоруссы могут думать, что белорусская школа для белоруссов будет мачехой, а не родной матерью*"[223].

[223] LVVA, 2125 f., 5 ap., 39 l., 9–10 lpp.

Перашкодай на шляху беларускай школьнай справы быў нізкі ўзровень нацыянальнай свядомасці беларускамоўнага насельніцтва, а таксама супраціў часткі настаўнікаў-небеларусаў. Апошнія нярэдка не разумелі патрэбы ператварэння іх школ з рускіх ці польскіх – у беларускія. 12 лютага 1922 г. кіраўнік Борхаўскай школы ў лісце К. Езавітаву прасіў паведаміць, ці беларуская мова будзе мовай усіх прадметаў, ці асобным прадметам. Пры гэтым ён не выступаў супраць беларускай мовы, а толькі хацеў сумленна выконваць свае абавязкі. Варта дадаць, што гэты чалавек меў 19-гадовы стаж педагагічнай працы ў рускай школе[224].

Каб супакоіць эмоцыі, беларускі актыў інфармаваў педагогаў, што надание школам беларускага характару не выкліча кадравых змен, а абмяжуецца ўвядзеннем прадмету па беларускай мове. 3 снежня 1921 г. С. Сахараў у звароце да настаўнікаў тлумачыў, што некаторыя з іх няправільна зразумелі ператварэнне іх школ у беларускія. Што школы, як і раней, будуць функцыянаваць паводле агульнапрынятых у Латвіі законаў, але настаўнікі павінны "*более подробно знакомить своих детей с историей, географией и этнографией Белоруссии (б. западного края Росссии). На педагогическом персонале лежит обязанность разъяснить это населению и указывать, что каждая национальность имеет свою родную школу и что белоруссы также должны иметь свою родную школу, в которой их дети будут получать национальное воспитание. Педагогические и школьные советы дожны осведомлять Белорусский Отдел о всех пожеленіях местного белорусского населения в отношении школ, напр., может быть раздаются голоса в местностях с католическим населением о желательности введения польского языка в школах, как языка религии и т.п. Польский язык может в таких случаях быть введен, как отдельный предмет, по ходатайству школьного совета перед Белорусским Отделом*"[225].

Аналіз даступных крыніц дазваляе меркаваць, што стаўленне насельніцтва да беларускіх школ было розным. У сітуацыі, калі беларускамоўнае сялянства мела клопаты з нацыянальнай самаідэнтыфікацыяй, іх думкамі можна было лёгка маніпуляваць. У справаздачы за 1921/22 гг. С. Сахараў канстатаваў, што ў Латгаліі было пашыранае меркаванне, што беларускамоўны каталік гэта паляк, а праваслаўны – рускі[226]. Кіраўнік Беларускага школьнага аддзела С. Сахараў лічыў, што нацыянальна маласвядомае сялянства выступала супраць беларускіх школ пад уплывам мясцовых польскіх і рускіх актывістаў[227]. Аднак сапраўднай прычынай нежадання некаторых бацькоў, каб іх дзеці

[224] LVVA2125 f., 5, ap., 125 l., 8 lp.

[225] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 47, л. 4.

[226] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 110, л. 3–5.

[227] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 167, л. 9.

атрымлівалі асвету на беларускай мове, быў нізкі сацыяльны статус гэтай мовы ў вачах сялянства. У выніку каталіцкае насельніцтва жадала, каб іх дзеці навучаліся па-польску, а праваслаўнае – па-руску, а ў навучанні на беларускай мове не бачылі патрэбы. Пра моцныя пазіцыі гэтых моваў у беларускім школах сведчыць выпадак, які адбыўся ў 1923/24 гг. Педагагічная рада Стараслабодскай 6-гадовай школы адмовілася прыняць у 5-ы клас выпускніка ў Цуцурскай 4-гадовай школы, спасылаючыся на кепскае веданне рускай мовы[228]. У некаторых школах (у Прыдруйскай, Пустынскай і Максімаўскай валасцях Даўгаўпілскага павета) бацькі былі гатовыя пагадзіцца, каб школа, якую наведвалі іх дзеці, лічылася беларускай, але пры ўмове, што замест беларускай мовы там будуць вывучаць латышскую, рускую ці польскую[229]. Напружаная сітуацыя склалася вакол Юхнявецкай школы, дзе 9 снежня 1923 г. бацькоўскі сход выказаў жаданне, каб выкладанне адбывалася на рускай мове, а беларуская была названая непатрэбнай іх дзеткам. Адначасова бацькі бачылі патрэбу павялічыць колькасць гадзін латышскай і польскай моваў[230].

Непрыхільнае стаўленне прынамсі часткі насельніцтва да беларусізацыі школ пацвярджаюць назіранні мясцовага настаўніцтва. У лісце (ад 10 студзеня 1922 г.) кіраўніка Борхаўскай школы І. Шостака чытаем: "*Я лично согласен с мнениями Люцинской Школьной Управы и Белорусского Отдела, именно, что Яновольская волость всегда принадлежала к белорусскими волостям. При представлении же сведений Белорусскому Отделу мне пришлось руководствоваться мнением родителей учеников. Из них только один считал себя белоруссом, а остальные 89 считали себя великоруссами. С моей стороны допущен недосмотр при представлении сведений Отделу в том смысле, что в графе 'русские' должо стоять 'великоруссы'. Должен еще сказать, что опрос я сделал несколько раз, давая необходимые пояснения, но почему родители учеников считают себя и своих детей великоруссами, а не белоруссами, мне неизвестно. Стало быть составляя сведения о национальном составе учеников я руководствовался исключительно соображениями родителей учеников. Очень прошу Белорусский Отдел сообщить, к каким школам отнесена Борховская основная школа, к белорусским или к русским*"[231]. Тым часам, настаўніца адной са школ пісала К. Езавітаву: "*Вучэнне ў маёй школе пачалося 15 кастрычніка. Вучняў 30, усе толькі беларусы і ведаюць толькі сваю мову; было б і болей, але малая школа. Дзеткі мае ўжо ведаюць два вершы. Сялянства адносіцца добра, толькі не ўсе хочуць вучыць сваіх дзяцёў па-беларуску, гаворуць 'хамску мову мы добра ведаем, нам трэба па-расейску',*

[228] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 45, л. 3.
[229] LVVA, 2125 f., 5 ap., 39 l., 57–59 lpp.
[230] LVVA, 2125 f., 5 ap., 136 l., 29 lp.
[231] LVVA, 2125 f., 5 ap., 39 l., 20 lp.

другі не хочуць па-латышску ‘цяжка вучыць і не трэба кружыць галавы’”[232]. У студзені 1922 г. кіраўніца Карклінаўскай школы, якую наведвалі 22 беларусы і 4 рускія, інфармавала, што некаторыя бацькі патрабуюць, каб усе прадметы з першага класа вывучаліся на рускай мове і некалькі гадзін – на польскай. Настаўніца прасіла парады, як выкладаць, каб не выклікаць незадавальнення бацькоў[233]. У студзені 1923 г. настаўнік Пётр Клявінь выказваў непакой у сувязі з тым, што ворагі беларушчыны імкнуцца ліквідаваць беларускія школы. Ён лічыў, калі беларускія сілы будуць бяздзейнічаць, дык у Істэрскай воласці не застанецца ніводнай. П. Клявінь пісаў пра штодзённыя наракання жыхароў, што беларускія школы ім непатрэбныя[234].

Разам з тым у архіўных крыніцах захоўваюцца сведчанні пазітыўнага стаўлення сялянства да беларускіх школ. Паводле К. Езавітава, лепш да іх ставілася праваслаўнае насельніцтва, чым каталіцкае[235]. Аналіз дастуных крыніц не пацвярджае гэтых назіранняў. Вядомыя прыклады падтрымкі беларускай школьнай справы як з боку праваслаўных, так і з боку каталікоў. Напрыклад, 31 жніўня 1921 г. да К. Езавітава як “прадстаўніка беларускіх інтарэсаў” звярнуліся настаўнікі школ Пустынскай воласці Віктар Дзяргач і Фелікс Каляда, якія інфармавалі, што “*ў нашай воласці калі 800 сялян, усе беларусы католікі. Усяго 4 беларускія школы і пятая арганізуецца. Да гэтага часу вучылі дзіцей па-руску, бо няма беларускіх ксёнжак і ніхто не чуў беларускай літаратуры*”[236]. У верасні 1921 г. Віктар Дзяргач (Юхнявецкая школа) пісаў, што мясцовыя сяляне зацікавіліся беларускасцю (“чакаюць беларускага спектакля”), таму прасіў К. Езавітава, каб ён асабіста наведаў Пустын і распавёў жыхарам пра беларускія справы[237]. Кіраўнік Шушкаўскай школы (Ляўдарская воласць Лудзенскага павета) 12 студзеня 1922 г. адзначаў, што насельніцтва падначаленага яму школьнага раёну прыхільнае да беларускай школьнай справы. На яго думку, людзі выяўлялі цікавасць да Беларусі і беларускай адукацыі. Ён прасіў, каб К. Езавітаў прыслаў прадстаўніка, які б мог азнаёміць сялян з беларускімі справамі[238].

Варта працытаваць ліст К. Езавітаву аднаго з жыхароў Ізабэлінскай воласці Мар’яна Гуцэвіча: “*Два разы быў на курсах* [беларускіх настаўніцкіх курсах – ЕГ] *дужа падабаецца, што наканец дажыў да таго часу, што магу*

---

[232] LVVA, 2125 f., 5 ap., 207 l., 3 lp.

[233] LVVA, 2125 f., 5 ap., 139 l., 5 lp.

[234] LVVA, 2125 f., 5 ap., l. 207, 3 lp.

[235] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 19, л. 11.

[236] LVVA, 2125 f., 5 ap., 135 l., 1 lp.

[237] Настаўнік пісаў: “*Пан Езавітаў, калі ласка, прыедте каторую нядзелю ў Пустыню да пачатку вучэнія падняць дух беларускі ў нашым маладушным грамадзянстве*”. LVVA, 2125 f., 5 apr., 135 l., 3–5 lpp.

[238] LVVA, 2125 f., 5 ap., 69 l., 5 lp.

на сваёй роднай мове чуць літаратурную гутарку і навуку (...) Прыехаўшы дахаты я разсказаў сваім грамадзянам, што ўжо ёсць і на нашай роднай мове навука. Яны адказаліся на гэта з бальшой радасцю і просяць мяне, каб я перад Вамі попрасіў адкрыць школы тут на роднай мове і беручы ўсё гэта ў ум. З сваёй стараны прашу пана інспектара абраціць вніманіе і на наш край, дзе многа беларусаў. Я сам готовы ўсякую мінуту служыць і несці якія бы то ні было цяжобы, ліш толькі далі бы мне срэдства да жызні. Тожа хацеў бы чытаць беларускую літаратуру і вучыцца, но нідзе не магу палучыць кніг. Еслі ў Вас вазможна палучыць учэбнікі і што-небудзь з літаратуры, то прасіў бы аддалжыць"[239]. Тым часам, у заяве жахароў вёсак Парышкі, Падлесіца, Зукулішкі, Ляксы, Бернішкі і Лонькі Ізабэлінскай воласці чытаем: "*Дзеці нашы да цяперашняга часу застаюцца без усякай адукацыі, бо найбліжэйшая да нас школа М.-Індрыцкая знаходзіцца на адлегласці каля 5 вёрст, і дарога для дзяцей з прычыны розных стыхійных умоваў бывае недаступная. Пагэтаму мы вымушаныя звярнуцца да Вас з просьбай пра адкрыццё для нашых дзетак, як прыналежных да беларускай нацыянальнасці, беларускай школы (...) Дзяцей школьнага веку, якія жадаюць наведваць школу, налічваецца 53 і спіс прыкладаем пры тым*"[240].

У архіве Беларускага школьнага аддзела захоўваюцца таксама заявы жахароў Янапольскай воласці з патрабаваннем адчыніць дадатковыя беларускія школы, бо іх дзецям надта далёка было хадзіць ва ўжо існучыя[241]. У заяве каталікоў-жыхароў вёсак Войні, Козіды, Геркі і Грыбулі Краслаўскай воласці чытаем: "*Мы, ніжэйпадпісаўшыя свой подпіс, сяляне вёсак Войні, Козіды, Геркі і Грыбулі просім Яго мосця Інспектара закласці ў нас беларускую ўрадавую школу, у якой мы жадаем вучыць сваіх дзетак. Школа будзе мясціцца ў прыватнай будоўлі. Паблізу ў нашай воласці школак німашака, апроч Краслаўскіх школ, а места Краслаўка ад нас у 6–8 вярстох*"[242].

Кіраўнік Беларускага школьнага аддзела С. Сахараў дзяліўся сваімі развагамі пасля падарожжа ў тыя мясціны: "*Ужо пад'язджаючы да гэтых вёсак на нашае пытанне, звернутае да аднаго сустрэчнага латгальца, хто ў гэтых вёсках жыве, атрымалі азначальны адказ 'беларусы', і 'гутараць яны на сваёй беларускай мове'. У вёсцы Войны мы мелі прыстойку ў адной беларускай сямейцы, дзе нават знайшлася кніга беларускіх вершаў. Паводле слоў маладога гаспадара, у гэтай вёсцы жывець, галоўным чынам, беларускае жыхарства, хоць пападаюцца і асобныя латышскія сем'і. Гэтак, зайшоўшы да аднаго 96-летняга дзеда, заўважылі, што яго сын і нявестка досыць добра гутараць*

[239] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 46, л. 4–5.
[240] LVVA, 2125 f., 5 apr., 50 l., 25 lp.
[241] LVVA, 2125 f., 5 apr., 47 l., 10, 14 lpp.
[242] LVVA, 2125 f., 5 apr., 50 l., 26 lp.

па-латышску. Сын растлумачыў, што ён з 17-летняга ўзросту быў на заработках у Рызе, з беларускай мовы там смяяліся, і ён вывучыўся больш гутарыць на латышскай і расейскай мовах. У следуючых вёсках Грыбулі і Геркі мы знайшлі таксама беларускае жыхарства. Прыезд наш у Грыбулі быў спатканы асобнымі сялянамі с радасцяй, і яны надта прасілі заснаваць для іх дзяцей беларускую школу. Селянін, гутарыўшы з намі, зрабіў вельмі разумную ўвагу, што 'яны і іх дзеці гутараць толькі па-беларуску і што калі яны будуць вучыцца на сваёй роднай мове, то яны хутчэй потым навучацца і другім мовам, а асабліва ўрадавай мове. Зараз у нас ёсць недалёка латышская школа, але мы туды сваіх дзецей не пасылаемо, бо яны там нічога не разумеюць'. У вёсцы Герках чутна была беларуская гутарка, і ішоўшыя са жніва кабеты спявалі беларускую песню. Некаторыя з жыхароў вёскі Геркі, дзякуючы суседству Краслаўкі і некаторых латгальскіх вёсак, умеюць гутарыць і па-латышску, напрыклад, старшыня ў в. Герках з'ясняўся з намі па-латышску. У гэтай вёсцы знайшоўся ўпаўне падхадзячы дом для школы ў адной удавы"[243]. У сувязі з гэтым С. Сахараў хадайнічаў перад міністрам асветы пра адкрыццё 4-гадовай беларускай школы ў Герках. Аўтар падкрэсліваў, што гэта не пашкодзіць латышскай, якая месцілася па суседстве, паколькі "*ў латышскую школу пойдуць дзеці мясцовых латгальцаў, а ў беларускую школу – пойдуць беларусы. Такім чынам, мясцовае жыхарства будзе задаволена і выбаўлена магчымасці заставацца ў цямноце сваіх бацькоў і дзядоў*"[244].

Заслугоўвае ўвагі сітуацыя ў вёсцы Доўгія Кушняры Эверсмуйжскай воласці Лудзенскага павета, дзе ўлетку 1923 г. група праваслаўных беларусаў звярнулася да мясцовай і павятовай улады з патрабаваннем адчыніць беларускую школу. Арганізатарская праца была даручана Уладзіміру Ціхаміраву[245]. У заяве, перададзенай К. Езавітаву, сяляне выказвалі гатоўнасць аддаць пад класнае памяшканне частку свайго жылога будынка. Не апошнюю ролю ў акцыі на карысць беларускай школы адыграў святар мясцовай Слабадской парафіі Аляксей Буднікаў, які заклікаў сялян аддаваць дзяцей у беларускую школу[246]. У верасні 1923 г. парафіяльная рада Слабадской царквы звярнулася ў Беларускі школьны аддзел з просьбай адчыніць на тэрыторыі парафіі 4-гадовую беларускую школу[247].

Здараліся адзінкавыя выпадкі, калі жаданне аддаваць дзецей у беларускія школы выказвалі сяляне-латгальцы. 24 кастрычніка 1922 г. кіраўнік Шушкаўскай школы паведамляў, што мясцовыя латгальцы байкатуюць

---

[243] LVVA, 2125 f., 5 ap., 40 l., 136 lp.

[244] LVVA, f. 2125, ap. 5, l. 40, 136 lp.

[245] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 44, л. 1.

[246] LVVA, 2125 f., 5 ap., 53 l., 1, 6 lpp.

[247] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 45, л. 23.

латышскую школу, адкрытую ў суседняй вёсцы Казлова, і на знак пратэсту дэкларуюць, што іх дзеці будуць хадзіць у беларускую школу[248].

Пэўны супраціў беларускай школьнай справе назіраўся з боку мясцовай адміністрацыі і самакіравання ў Латгаліі, у якіх адсутнічалі прадстаўнікі беларусаў[249]. Да ліку асоб, якія, на думку К. Езавітава, не спрыялі развіццю беларускай школьнай справы, быў інспектар асноўных школ Лудзенскага павету Свэнэ, які наступным чынам адрэагаваў на дэкларацыю беларусаў пра стварэнне ўласных школ: "*Беларусы добра разумеюць расейскую мову, а таму адкрыццё асобных беларускіх школ лічу непатрэбным*"[250]. У падобным духу выказваўся настаўнік У. Ціхаміраў, які сцвярджаў, што Свэнэ быў адзіным, хто ад пачатку існавання беларускіх школ адмоўна ставіўся да іх і не бачыў патрэбы ў стварэнні Беларускага школьнага аддзела[251].

Нізкі ўзровень нацыянальнай самаідэнтыфікацыі латгальскай вёскі даваў прыхільнікам і праціўнікам стварэння беларускіх школ значныя магчымасці інтэрпрэтацыі нацыянальнага складу вучняў. Падлікі адных і другіх у дачыненні да адных і тых жа школ адрозніваліся дыяметральна. Напрыклад, пасля інспекцыі Лунеўскай школы К. Езавітаў сцвярджаў, што ў ёй вучаліся 36 беларусаў і 21 латыш. Тым часам, на пасяджэнні Лудзенскай павятовай школьнай управы інспектар Свэнэ заявіў, што школу наведваў 31 латыш-латгалец, 16 рускіх, 11 палякаў і толькі 2 беларусы. На гэтай падставе ўправа пастанавіла перадаць школу ў падпарадкаванне Агульнага школьнага дэпартамента[252]. Беларускія дзеячы не пагаджаліся з статыстыкай, пададзенай інспектарам, і прасілі адчыніць у гэтай школе беларускі клас[253]. Справай вызначэння нацыянальнасці вучняў займаліся валасныя камісіі, якія накіроўвалі ў спрэчныя школы. У сваёй працы яны абапіраліся на вынікі пашпартных кніг або сямейных спісаў. Аднак не заўсёды гэтая дакументацыя ўтрымлівала неабходныя звесткі. Напрыклад, у выпадку Пасіенскай воласці ў большасці жыхароў у рубрыцы "нацыянальнасць" было пазначана толькі веравызнанне[254]. Нярэдка пад наглядам камісіі склікаўся бацькоўскі сход, каб даведацца меркаванне бацькоў. Беларускі актыў крытычна ацэньваў працу камісіі[255]

---

[248] LVVA, 2125 f., 5 ap., 214 l., 48 lp.

[249] М. Голдманис, *"Белорусский" дискурс в латышской прессе (1920–1934): эволюция представления о белорусах как о самостоятельном национальном меншинстве*, "Латыши и белорусы: вместе сквозь века", Минск 2016, № 5 с. 70–72.

[250] К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, Рыга 1927 [перадрук: Ню-Ёрк – Менск] 2013, с. 58–59.

[251] LVVA, 2125 f., 5 ap., 106 l., 8 lp.

[252] LVVA, 2125 f., 5 ap., 200 l., 14 lp.

[253] LVVA, 2125 f., 5 ap., 200 l., 16 lp.

[254] LVVA, 2125 f., 5 ap., 39 l., 11 lp.

[255] Вось што пісаў К. Езавітаў: "*Члены камісіі не заўсёды з належнаю ўстрыманасцю ставіліся да высілкаў беларускага інспектара і часам спяшаліся 'хутчэй скончыць справу', але ўсё-ж-такі*

і мясцовых чыноўнікаў. Наступным чынам паводзіны мясцовых школьных чыноўнікаў ацэньваў К. Езавітаў: "*На жаль, тутака на месцах Латвійскія Урадовыя Чыноўнікі, слухаючы розныя сплёткі аб беларусах, распускаемыя расейцамі і палякамі, не панімаюць нас і займаемай намі пазыцыі і не заўсёды ідуць нам на спатканне*"[256].

На думку беларускага боку, значная частка прадстаўнікоў мясцовых улад не разумела асветных патрэб беларускай меншасці. Найчасцей гэтыя засцярогі тычыліся самакіравання на Лудзеншчыне. 24 лютага 1922 г. кіраўніцтва Беларускага школьнага аддзела было вымушана звярнуцца са зваротам да міністра асветы з просьбай растлумачыць Лудзенскай гарадской думе, што беларусы нароўні з прадстаўнікамі іншых нацыянальных меншасцей карыстаюцца нацыянальна-культурнай аўтаноміяй, якую гарантуе ім латвійскае заканадаўства, і ўсвядоміць, што якая-колечы дыскрымінацыя беларусаў недапушчальная. Больш за тое, аўтары звароту прасілі міністра ўнутраных спраў не зацвярджаць гарадскога школьнага бюджэту да таго моманту, пакуль не будуць у ім прадугледжаныя выдаткі на мясцовую беларускую школу[257]. Вельмі крытычным у дачыненні да палітыкі мясцовых улад быў К. Езавітаў. Беларускі дзеяч пісаў пра выпадкі забароны беларускіх пастановак, запалохванне і дыскрымінацыю найбольш актыўных беларускіх настаўнікаў. На думку К. Езавітава, гарадское самакіраванне ў Даўгаўпілсе і Лудзы да пачатку 1923 г. марудзіла з прыняццем тамтэйшых прыватных беларускіх школ у сетку асноўных школ нягледзячы на тое, што туды ўжо было набрана 150–160 вучняў. Тым часам у Даўгаўпілсе, нават пасля прыняцця беларускай школы ў сетку, мясцовае самакіраванне адмаўлялася даць школе памяшканне, апал, электрычнасць, мэблю і іншыя сродкі[258].

Меркаванне К. Езавітава можна было б лічыць суб'ектыўным, але аналіз даступных крыніц прынамсі часткова пацвярджае праўдзівасць яго слоў. Супрацоўнікаў мясцовых улад адкрыццю беларускіх школ быў заўважаны па ўрадавым узроўні. 23 сакавіка 1922 г. супрацоўніца міністра асветы Валерыя Сейле (*Valērija Seile*) была вымушана выслаць інструкцыі школьным інспектарам у Ілукшце, Даўгаўпілсе, Рэжыкнэ, Лудзы і Лудзенскім павеце пра тое, што беларусы маюць такія ж правы на нацыянальна-культурную аўтаномію, як іншыя нацыянальнасці, таму ў месцах іх пражывання могуць стварацца

дзве школы, у якія камісія выязджала разам з беларускім інспектарам: Пустынская школа і 1-я Прыдруйская – не былі канчаткова згублены беларусамі: абедзве школы былі перададзены, праўда, у Агульным дэпартаменце, але ў іх асталося выкладанне беларускае мовы, асталіся вучыцелі-беларусы, а варожыя нам вучыцелі-расейцы і палякі былі пераведзены ў іншыя школы". К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, Рыга 1927 [перадрук: Нью-Ёрк – Менск] 2013, с. 94–95.

[256] LVVA, 2125 f., 5 ap., 39 l., 59 lp.

[257] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 43, л. 3–4.

[258] К. Езавітаў, *Становішча беларускае школы ў Латвіі*, Вільня 1923, с. 17.

беларускія школы. Адначасова падчас пасяджэння парламенцкай бюджэтнай камісіі палітык аспрэчыла аргументы праціўнікаў фінансавання беларускіх школ, падкрэсліўшы, што беларусы ў Латвіі існуюць, нягледзячы на тое, што ў іншых краінах існаванне такога народа адмаўляецца[259].

Слушнасць крытыкі на адрас прадстаўнікоў самакіравання і чыноўнікаў ніжэйшага ўзроўню пацвярджаецца ў аналізе канкрэтных выпадкаў. На пачатку 1920-х гг. К. Езавітаў і У. Ціхаміраў планавалі адчыніць школу ў вёсцы Доўгія Кушняры (Эверсмуйжская воласць). Нягледзячы на рэгістрацыю каля 60 вучняў, Эверсмуйжская валасная ўправа адмовілася даць грошы на ўтрыманне школы. У выніку К. Езавітаў прасіў бацькоў, каб яны пагадзіліся адчыніць прыватную беларускую школу. У рэшце рэшт школа адчынілася 30 лістапада, калі У. Ціхаміраў пачаў заняткі з 10 вучнямі. Да сярэдзіны снежня іх колькасць вырасла да 26[260]. Статут установы не быў зацверджаны, што дало латышскаму школьнаму інспектару Лудзенскага павета нагоду зачыніць школу як "нелегальную"[261]. У студзені 1924 г. кіраўнік Доўгакушняроўскай школы У. Ціхаміраў скардзіўся на мясцовага інспектара, які пераконваў настаўніка перайсці ў латышскую школу, бо беларуская справа бесперспектыўная[262].

Беларускі бок намагаўся супрацьдзейнічаць праявам неталерантнасці. Каб прадставіць у станоўчым святле беларускую школьную справу К. Езавітаў надрукаваў шэраг артыкулаў у штомесячніку Міністэрства асветы "Izglītības Ministrijas Mēnešraksts", у якіх інфармаваў пра стан беларускай школьнай справы і яе праблемы. Беларускі школьны аддзел прасіў Агульны школьны дэпартамент Міністэрства асветы растлумачыць Даўгаўпілскай павятовай школьнай управе і павятоваму школьнаму інспектару, што падтрымка беларускіх школ адпавядае інтарэсам латвійскай дзяржавы[263].

Уяўленне пра баталіі беларускіх дзеячаў з прадстаўнікамі мясцовага самакіравання за існаванне беларускіх школ даюць выпадкі, звязаныя са стварэннем школ у гарадскіх мясцовасцях – Даўгаўпілсе, Лудзы і Краславе. Іх спецыфіка была ў тым, што ў гарадах беларусы складалі найменшы адсотак насельніцтва і не мелі прадстаўнікоў у органах мясцовага самакіравання. Варта падрабязней прыгледзецца да стварэння гарадскіх школ. У Даўгаўпілсе беларуская школа магла з'явіцца шляхам рэагранізацыі адной з ужо дзейных гарадскіх школ. У горадзе было шэсць рускіх і чатыры польскія школы.

---

[259] Э. Екабсонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [в:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 51.

[260] LVVA, 2125 f., 5 apr., 53 l., 28 lp.

[261] К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, Рыга 1927 [перадрук: Нью-Ёрк – Менск 2013], с. 103–104.

[262] LVVA, 2125 f., 5 apr., 53 l., 1, 8 lpp.

[263] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 43, л. 5–6.

Беларускі актыў абраў за мэту беларусізаваць 2-ю рускую школу, у якой вучылася найбольш беларусаў. Інспектар К. Езавітаў атрымаў права стварыць падрыхтоўчы беларускі клас у гэтай школе. Аднак амбіцыі дзеяча сягалі далей. Ён узяўся збіраць подпісы пад петыцыяй пра ператварэнне гэтай школы ў 1-ю беларускую[264]. У адказ праціўнікі рэагранізацыі пачалі шырокую кампанію па дыскрэдытацыі беларускай школьнай справы. Катэхет школы а. Гаўрыла Чалпанаў з царкоўнай кафедры асудзіў беларускія школы сцвярджаючы, што іх мэтай з'яўляецца апалячванне беларусаў і вяртанне рэлігійнай уніі. Пад уплывам гэтай кампаніі некаторыя бацькі адклікалі свае подпісы, якія раней ставілі пад заявай аб адкрыцці беларускай школы. Скліканы ў такой атмасферы бацькоўскі сход адмоўна паставіўся да перайменавання школы ў беларускую[265].

4 лютага 1922 г. адбылося пасяджэнне педагагічнай рады 2-й рускай школы, удзельнікі якога выказаліся катэгарычна супраць ператварэння школы ў беларускую. Матывы былі наступныя: у школе на 334 вучні толькі 52 запісаліся беларусамі; заява ва ўправу пра перайменаванне школы была пададзеная незаконна (63 подпісы ад імя 80 вучняў), бо подпісы бацькоў былі атрыманыя ашуканствам[266]. 5 лютага такое ж рашэнне прыняла школьная рада школы. Пры гэтым падчас пасяджэння некаторыя бацькі абураліся тым, што К. Езавітаў увёў іх у зман. У прыватнасці, прадстаўнік бацькоў Пахомаў сцвярджаў, што ён ніколі не лічыў сябе беларусам (нарадзіўся ў Пецярбургу), але быў паінфарамаваны, што школа будзе перайменаваная ў беларускую, таму калі ён хоча, каб яго дзеці працягвалі наведваць яе, мусіць падпісаць петыцыю. Іншы прысутны, Каралюк, засведчыў, што асабіста ён нічога не падпісваў, а калі прыйшоў чалавек з петыцыяй, яго маці несвядома паставіла подпіс[267].

Інспектар К. Езавітаў не хаваў роспачы. 6 лютага 1922 г. ён пісаў кіраўніку С. Сахараву: "*справа перайменаваньня II-й расейскай школы ў беларускую пачынае змяняцца, бо некаторыя вялікарускія сферы пачалі нам процівадзействаваць. Прыйдзецца ставіць справу аб адчыненні зусім новай беларускай школы*"[268]. На наступны дзень, 7 лютага 1922 г. Даўгаўпілская гарадская школьная ўправа вырашыла, што яна гатова ў 1922/23 гг. адчыніць беларускую асноўную школу з рускай мовай навучання з магчымасцю для вучняў-каталікоў наведваць заняткі польскай мовы[269]. Аднак на гэтым

[264] LVVA, 2125 f., 5 ap., 126 l., 1 lp.
[265] LVVA, 2125 f., 5 ap., 66 l., 28–29 lpp.
[266] LVVA, 2125 f., 5 ap., 125 l., 59 lp.
[267] LVVA, 2125 f., 5 ap., 125 l., 38–39 lpp.
[268] LVVA, 2125 f., 5 ap., 38 l., 2 lp.
[269] LVVA, 2125 f., 5 ap., 125 l., 11 lp.

клопаты беларускіх актывістаў не скончыліся. З ініцыятывы Даўгаўпілскай гарадской школьнай управы 19 лютага быў скліканы сход бацькоў школы. У сходзе ўзяло ўдзел 135 бацькоў, з якіх 110 выказаліся супраць ператварэння школы ў беларускую і толькі 20 падтрымалі. На сходзе панавала нервовая атмасфера. Каб залагодзіць прысутных, К. Езавітаў абвясціў, што на пачатку мовай выкладання ў беларускай школе будзе руская[270].

25 лютага 1922 г. таварыства "Бацькаўшчына" зноў звярнулася ў Даўгаўпілскую гарадскую школьную ўправу з просьбай адчыніць у горадзе беларускую школу. Удалося назбіраць 22 подпісы бацькоў, якія пагадзіліся, каб іх дзеці (37 чал.) вучыліся па-беларуску. Аднак апошняя не дала адказу. У сувязі з гэтым таварыства "Бацькаўшчына" звярнулася да інспектара беларускіх школ з просьбай стварыць беларускую школу пры настаўніцкіх курсах[271]. 27 сакавіка на пасяджэнні Даўгаўпілскай школьнай гарадской рады К. Езавітаў безвынікова спрабаваў дамагчыся адкрыцця ў горадзе беларускай школы. Яго патрабаванні выклікалі адмоўную рэакцыю з боку значнай часткі сяброў установы, якая марудзіла са згодай на адкрыццё беларускай школы. Замест гэтага орган прапанаваў стварыць беларускі камплект або клас у 2-й рускай школе[272].

У адказ на бяздзейнасць гарадскога самакіравання 25 красавіка 1922 г. "Бацькаўшчына" звярнулася да інспектара беларускіх школ з просьбай, каб ён паставіў перад Беларускім школьным аддзелам пытанне аб адкрыцці беларускай пачатковай школы пры Даўгаўпілскіх беларускіх настаўніцкіх курсах[273]. У гэты ж дзень К. Езавітаў прапанаваў кіраўніцтву Беларускага школьнага аддзела адчыніць школу і даручыць яе кіраванне А. Якубецкаму. Да дакумента быў далучаны спіс 46 дзяцей[274]. Апрача таго, 2 траўня 1922 г. таварыства "Бацькаўшчына" звярнулася да міністра асветы з просьбай дапамагчы ў адкрыцці беларускай асноўнай школы ў Даўгаўпілсе[275].

8 траўня 1922 г. Даўгаўпілская гарадская школьная ўправа, на пасяджэнні якой не прысутнічаў К. Езавітаў, прыняла рашэнне аб адкрыцці ў горадзе беларускай асноўнай школы (*Daugavpils pilsētas baltkrievu pamatskola*). Згодна з пастановай, адкрыццё школы магло адбыцца пры ўмове, што набярэцца адпаведная колькасць вучняў. Іншай умовай стварэння школы была праца ў ёй настаўнікаў-беларусаў, якія дасюль працавалі ў рускіх школах. Горад не мог узяць на працу новых педагогаў, паколькі міністр асветы вызначаў колькасць

---

[270] LVVA, 2125 f., 5 ap., 176 l., 15–17 lpp.
[271] LVVA, 2125 f., 5 apr., 103 l., 3 lp.
[272] LVVA, 2125 f., 5 ap., 126 l., 20–21 lpp.
[273] LVVA, 2125 f., 5 ap., 126 l., 1 lp.
[274] LVVA, 2125 f., 5 ap., 126 l., 3 lp.
[275] LVVA, 2125 f., 5 ap., 66 l., 28–29 lpp.

ставак, якіх у Даўгаўпілсе было 150[276]. Згодна з рашэннем Даўгаўпілскай гарадской школьнай управы ад 26 траўня 1922 г. школа мусіла адчыніцца з пачаткам 1922/23 гг. Тлумачачы прычыну затрымкі рашэння аб стварэнні школы, інспектар Л. Азоліньш сцвярджаў, што гэта адбылося праз "некарэктныя паводзіны" К. Езавітава[277]. Чыноўнік лічыў, што апошні, замест таго, каб пачаць арганізацыю школы "з нуля", здзейсніў замах на ўжо дзейную 2-ю рускую школу. Пры гэтым Л. Азоліньш вінаваціў беларускага калегу ў несумленных і нахабных дзеяннях у дачыненні да бацькоў і настаўнікаў рускай школы[278].

Школа адчынілася 12 траўня 1922 г. як прыкладная пры Даўгаўпілскіх дзяржаўных беларускіх настаўніцкіх курсах. Заняткі пачаліся ў будынку на вул. Бульварнай 22. У гэты час школа складалася з трох класаў (падрыхтоўчага, 1-га і 2-га), якія наведвала 96 вучняў. Адной з галоўных цяжкасцей быў факт, што спачатку ў школе працаваў толькі адзін настаўнік-кіраўнік. Установа пачала працу не маючы ўласнага бюджэту, таму фінансавалася за кошт настаўніцкіх курсаў, а заняткі ў ёй праводзілі лектары і слухачы курсаў: Андрэй Якубецкі, Канстанцін Александровіч, Антаніна Антонава і іншыя[279]. Як пісаў К. Езавітаў, дырэктар А. Якубецкі "*працуе ў школцы адзін тамака, дзе і па ліку і па класах павінна працаваць не менш 3-х вучыцеляў (класных пакояў таксама 3 асобных); аднак курсантаў кінуць на вялікі час у класе няможна, і вось ён мусіць хадзіць з класу ў клас, каб усюды дапамоч, даць раду, даглядзець, апрача таго кожны дзень мусіць ён даць матэрыял, зрабіць разбор лекцыяў і падгатовіцца сам, на ім жа ляжыць і ўся Канцылярыя Школы*"[280]. Кіраўнік школы прасіў гарадское самакіраванне як мага хутчэй прызначыць новых настаўнікаў. Ён прапаноўваў узяць на працу на пасады педагогаў: сваю жонку А. Антонаву, К. Александровіча і Я. Камаржынскага[281]. 28 ліпеня 1922 г. беларускі бок звярнуўся да міністра асветы з просьбай павялічыць колькасць педагогаў. Аўтары звароту прапаноўвалі ўзяць на працу настаўнікаў, якія ведалі беларускую мову[282].

Пасля таго, як у жніўні 1922 г. настаўніцкія курсы скончылі працу, а курсанты раз'ехаліся па хатах, будучыня школы стала няпэўнай. 25 жніўня пачаўся запіс вучняў, падчас якога жаданне навучацца ў беларускай школе выказала 166 асоб. 1 верасня 1922 г. школа, у якой налічвалася ўжо 165 вучняў, пад кіраўніцтвам А. Якубецкага пачала наступны навучальны год[283].

---

[276] LVVA, 2125 f., 5 ap., 176 l., 15–17 lpp.
[277] LVVA, 2125 f., 5 ap., 126 l., 20–21 lpp.
[278] LVVA, 2125 f., 5 ap., 176 l., 15–17 lpp.
[279] LVVA, 2125 f., 5 ap., 176 l., 21 lp.
[280] LVVA, f. 2125, apr. 5, l. 42, 50 lp.
[281] LVVA, 2125 f., 5 ap., 38 l., 405 lp.
[282] LVVA, 2125 f., 5 ap., 176 l., 21 lp.
[283] LVVA, 2125 f., 5 ap., 38 l., 409 lp.

Тым часам, гарадское самакіраванне марудзіла з прызначэннем настаўнікаў[284]. У выніку двое з іх – А. Антонава і К. Александровіч – пагадзіліся працаваць бясплатна да моманту іх зацвярджэння Даўгаўпілскай гарадской школьнай радай. Акрамя таго, 10 верасня школьная рада вырашыла хадайнічаць перад гарадскім самакіраваннем аб прыняцці на працу педагогаў: а. Аўгустына Петэрсанса (*Augusts Pētersons*), Ніну Фельдман (настаўніцу Даўгаўпілскай беларускай гімназіі) і Мікірава (настаўніка Даўгаўпілскай мужчынскай рэальнай гарадской гімназіі)[285]. 14 верасня 1922 г. старшыня Даўгаўпілскай гарадской школьнай управы Прадцечанскі і інспектар асноўных школ Даўгаўпілса Л. Азоліньш наведалі школу і пераканаліся, што, нягледзячы на цяжкасці, яна працуе[286]. У гэты ж дзень управа разгледзела справу прыняцця на працу новых настаўнікаў. Па рэкамендацыі прадстаўніка рускага настаўніцтва Фармакова і інспектара рускіх школ Паліхронія Празарава было вырашана зацвердзіць на пасадзе педагога школы толькі А. Антонаву. У адказ К. Езавітаў склаў пратэст на дзеянні Даўгаўпілскай гарадской школьнай управы, якая, на яго думку, ускладняла працу беларускай школы[287]. Беларускі школьны інспектар лічыў дзеянні школьнай управы праявай дыскрымінацыі беларускай меншасці. За пасрэдніцтвам Беларускага школьнага аддзела пратэст быў скіраваны ў Аддзел асноўных школ Агульнага школьнага дэпартамента Міністэрства асветы[288].

Крытычны погляд на паводзіны Даўгаўпілскага гарадскога самакіравання падзяляў кіраўнік школы А. Якубецкі, які лічыў, што школьная ўправа ўключыла беларускую школу ў гарадскую школьную сетку толькі таму, што была пастаўлена перад фактам яе існавання, аднак у далейшым рабіла ўсё, каб не дапамагаць ёй. Дырэктар сцвярджаў, што ігнараванне патрэб школы з боку гарадскога самакіравання было прычынай таго, што заняткі адбываліся на падлозе праз адсутнасць парт, сталоў і зэдаляў[289].

З цягам часу штат школы ўсё ж быў павялічаны. У 1922/23 гг. у школе працавалі наступныя настаўнікі: А. Якубецкі (беларуская мова, матэматыка, геаграфія), А. Антонава (беларуская мова, матэматыка, краязнаўства, спевы, гімнастыка, каліграфія, ручная праца), К. Александровіч (беларуская мова, матэматыка, краязнаўства, спевы, гімнастыка), а. А. Петэрсанс (Закон Божы, латышская мова), Н. Фельдман (нямецкая мова) і Мікіраў (маляванне)[290].

---

[284] LVVA, 2125 f., 5 ap., 176 l., 25 lp.
[285] LVVA, 2125 f., 5 ap., 125 l., 52 lp.
[286] LVVA, 2125 f., 5 ap., 126 l., 31 lp.
[287] LVVA, f. 2125, apr. 5, l. 38, 470 lp.
[288] LVVA, 2125 f., 5 ap., 176 l., 27 lp.
[289] LVVA, 2125 f., 5 ap., 176 l., 33 lp.
[290] LVVA, 2125 f., 5 ap., 125 l., 35 lp.

Клопаты школы, аднак, не скончыліся. 21 кастрычніка 1922 г. беларускі бок падрыхтаваў зварот да міністра асветы з просьбай прызначыць частку бюджэту курсаў на карысць школы, каб павялічыць колькасць настаўнікаў[291]. 10 лістапада 1922 г. Даўгаўпілская гарадская школьная ўправа прыняла рашэнне хадайнічаць перад гарадской думай пра выдаткі на беларускую школу ў памеры 26 015 рублёў на перыяд з 1 верасня 1922 г. па 1 студзеня 1923 г. Аднак 15 студзеня 1923 г. гарадская дума галасамі 17 – за, 17 – супраць і 1- устрымаўся адхіліла прапанову. Супраць дапамогі беларускай школе выказаліся, напрыклад, дэпутаты польскай і рускай меншасцей, якія сцвярджалі, што "*белорусская школа создана путем заманивания учеников и что такого расхода не требуется ввиду того, что названная школа размещается в помещении средней белорусской школы*"[292]. Беларускі актыў не складаў аднак зброі. 21 студзеня 1923 г. школьная рада ўхваліла зварот да Беларускага школьнага аддзела з просьбай зацікавіцца справай утрымання школы і прымусіць мясцовыя школьныя ўлады ўзяць на ўтрыманне настаўнікаў[293]. Праз некалькі дзён, 26 студзеня 1923 г., школьная рада Даўгаўпілскай беларускай школы выказала пратэст супраць рашэння думы, палічыўшы яго абразай, і вырашыла зрабіць захады перад Латгальскім акруговым судом па прыцягненні да адказнасці некаторых яе дэпутатаў[294].

Пададзеныя вышэй факты сведчаць пра непрыхільнае стаўленне мясцовага самакіравання да беларускай школы. Можна пагадзіцца з К. Езавітавым, які пісаў кіраўніку Беларускага школьнага аддзела: "*Пасля цэлага года барацьбы і фактычнага існавання беларускае пачатковае школы ў Дзвінску, пасля некалькіх рашучых пратэстаў, удалося нам тутака дабіцца ўключэння нашае школы ў Гарадскую школьную сетку з I-IX-22 году. Здавалася, што далейшае змаганне за нашую школу будзе, з боку Дзвінскага Самаўпраўлення, спынена. Але 15 гэтага студзеня мы пераканаліся, што барацьба гэтая яшчэ цягнецца і скірована на тое, каб прымусіць Беларускую Пачатковую школу ў Дзвінску зачыніцца. Мястовая Дума, 15-I-23, пастанавіла не адпускаць беларускай школе грошай на яе ўтрыманне. Лічачы гэткую пастанову незаконнай, прашу срочнага Вашага захада перад Міністэрствам Прасветы і Унутраных Спраў аб адмене гэтае пастановы і аб выдачы Беларускай Пачатковай Школе грошай на ўтрыманне, пачынаючы з часу яе прыёму ў школьную сець горада*"[295].

Кіраўніцтва Беларускага школьнага аддзела і дырэктар школы разглядалі магчымасць дамагчыся атрымання ад гарадскога самакіравання

---

[291] LVVA, 2125 f., 5 ap., 176 l., 31 lp.

[292] LVVA, 2125 f., 5 ap., 176 l., 82 lp.

[293] LVVA, 2125 f., 5 ap., 126 l., 59 lp.

[294] LVVA, 2125 f., 5 ap., 125 l., 57 lp.

[295] LVVA, 2125 f., 5 ap., 126 l., 79 lp.; LVVA, 2125 f., 5 ap., 176 l., 79 lp.

дапамогі праз суд. 20 сакавіка 1923 г. кіраўніцтва Беларускага школьнага аддзела інфармавала А. Якубецкага, што з гэтай мэтай належыць сабраць ад бацькоў пісьмовыя заявы, а С. Сахараў лічыў пажаданым, каб бацькі самі падалі пратэст у гарадскую думу і Міністэрства асветы аб тым, што гарадская дума адмоўна ставяцца да беларускай школы. 5 траўня 1923 г. дзеяч звярнуўся да міністра асветы, заклікаючы, на падставе Закона аб адукацыі, зрабіць захады, каб Даўгаўпілскае гарадское самакіраванне аказала належную дапамогу беларускай школе[296].

У чэрвені 1923 г. кіраўнік школы сцвярджаў, што далейшае яна пад пагрозай закрыцця праз адсутнасць дапамогі ад гарадскога самакіравання[297]. На пачатку 1924/25 гг. прадстаўнікі рускай меншасці ў Даўгаўпілскай гарадской думе спрабавалі зачыніць школу, абгрунтоўваючы гэта нібыта нязначнай колькасцю ў яе мурах вучняў-беларусаў[298]. Нягледзячы на шэраг цяжкасцей, у 1924/25 гг. у школе быў адчынены 5-ы клас. У 1924 г. А. Якубецкі пісаў, што стварэнне класа дазволіць вучням працягнуць навучанне ў гімназіі, бо моладзь ужо звыклася з думкай, што школа і гімназія складаюць адно цэлае і разрыванне гэтай сувязі адмоўна паўплывае на настроі вучняў[299].

Увагі заслугоўвае таксама сітуацыя з беларускай школай у Лудзы. Паводле перапісу 1920 г., у горадзе на 6 тыс. жыхароў налічвалася 2 тыс. беларусаў. (sic!) Кіруючыся статыстычнымі звесткамі, таварыства "Бацькаўшчына" пачало старацца пра адкрыццё ў горадзе беларускай асноўнай школы. 8 лістапада 1921 г. Беларускі школьны аддзел звярнуўся ў Лудзенскую гарадскую школьную ўправу з просьбай стварыць у горадзе беларускую 6-гадовую школу і забяспечыць яе будынкам і інвентаром. Акрамя таго, ён прасіў даць звесткі наконт колькасці дзетак-беларусаў у мясцовых рускіх і польскіх школах, паколькі іх можна было б перавесці ў беларускую школу[300]. 15 снежня 1921 г. Лудзенская гарадская школьная ўправа пагадзілася стварыць у горадзе беларускую школу. Мовай навучання мусіла стаць руская, у дадатак па жаданні бацькоў дзяцей-каталікоў магла ўводзіцца польская мова як асобны прадмет. 1 студзеня 1922 г. Лудзенская школьная павятовая ўправа прыняла пастанову арганізаваць у горадзе 6-класную беларускую асноўную школу[301].

На кіраўніка і арганізатара школы Беларускі школьны аддзел прапанаваў Р. Плыгаўку, а настаўнікамі – Міхала Іванова, Стэфанію Васілеўскую-Казеку

---

[296] LVVA, 2125 f., 5 ap., 176 l., 103–106 lpp.

[297] LVVA, 2125 f., 5 ap., 35 l., 14 lp.

[298] А. Якубецкі, *Гісторыя разьвіцьця Дзьвінскай Беларускай Асноўнай Школы*, "Голас беларуса" 1926, № 19 ад 1 верасня, с. 4.

[299] LVVA, 2125 f., 5 ap., 176 l., 129 lp.

[300] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 45, л. 19.

[301] LVVA, 2125 f., 5 ap., 155 l., 18 lp.

і Пятра Мурніека. 13 лютага 1922 г. гарадское самакіраванне адмовілася даць беларускай школе асобнае памяшканне і матэрыяльна падтрымліваць яе. Гарадская дума пагадзілася толькі на тое, каб дазволіць беларускай школе карыстацца ўвечары будынкам мясцовай рускай школы. У адказ школьная рада навастворанай беларускай школы назвала рашэнне думы антызаконным і антыбеларускім, адмовілася дзяліць будынак з рускай гімназіяй і заклікала думу перагледзець рашэнне[302]. У выніку 15 лютага 1922 г. Лудзенская беларуская школа пачала працу ў будынку латышскай асноўнай школы[303].

З аналізу даступных крыніц бачна, што лудзенскае гарадское самакіраванне не спяшалася дапамагаць матэрыяльна беларускай школе. Сведчыць пра гэта факт, што С. Сахараў у лісце (22 лютага 1922 г.) у Лудзенскую гарадскую ўправу нагадваў, што адмова дапамагаць беларускай школе з'яўляецца парушэннем латвійскага заканадаўства[304]. У далейшым гарадская дума неаднойчы адмаўлялася выдаткоўваць сродкі на развіццё беларускай школы ў Лудзы. Прычынай быў супраціў дэпутатаў з ліку рускай меншасці. Пасля адкрыцця ў Лудзы беларускай сярэдняй школы туды перайшла частка вучняў мясцовай рускай школы, што выклікала скарачэнне ставак у рускай школе. Рускія дэпутаты гарадской думы аспрэчвалі мэтазгоднасць існавання беларускай школы ў горадзе, сумняваючыся, што ў ёй вучацца дзеці беларусаў. 6 верасня 1922 г. Беларускі школьны аддзел паскардзіўся міністру асветы на непрыхільнае стаўленне гарадскога самакіравання да беларускай школы[305]. Справа не знайшла аднак хуткага вырашэння. Яшчэ восенню 1922 г. Беларускі школьны аддзел патрабаваў ад лудзенскага самакіравання выдаткаваць неабходную матэрыяльную дапамогу беларускай школе. Урэшце, восенню 1922 г. школа была ўзятая на ўтрыманне гарадскога самакіравання[306].

Тым часам, існаванне беларускай школы ў Краславе аспрэчылі дэпутаты гарадской думы – палякі і габрэі. У снежні 1923 г. кіраўнік школы інфармаваў пра выпадкі дыскрымінацыі: адмову забяспечыць школу належным будынкам (у спадзяванні, што яна не пачне функцыянаваць, а дзеці "разбягуцца" па іншых школах); адмову выдаць вопратку найбяднейшым вучням. Дырэктар школы дабіваўся, каб краслаўскае самакіраванне прызначыла беларускай школе ўтрыманне з бюджэту на 1924 год. У адваротным выпадку школе пагражала знікненне, бо ў яе не было сродкаў на аплату памяшкання і заробкі настаўнікам[307]. Мясцовыя нядобразычліўцы сцвярджалі, што сярод

---

[302] LVVA, 2125 f., 5 ap., 155 l., 36–38 lpp.
[303] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 45, л. 14.
[304] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 45, л. 14–15.
[305] LVVA, 2125 f., 5 ap., 247 l., 53–54 lpp.
[306] LVVA, 2125 f., 5 ap., 13 l., 101 lp.
[307] LVVA, 2125 f., 5 ap., 146 l., 102–103 lpp.

вучняў школы беларусы не маюць большасці, таму існаванне беларускай школы лічылі непатрэбным. 14 ліпеня 1923 г. Краслаўская гарадская дума з ініцыятывы двух дэпутатаў (паляка Шумскага і габрэя Лур'е) пастанавіла абавязаць бацькоў, якія жадалі навучання дзяцей па-беларуску, падаць адпаведныя пісьмовыя заявы. 19 ліпеня 1923 г. у думе адбылося галасаванне ў справе закрыцця беларускай школы. Вынікі былі наступныя: 8 – за, 5 – супраць, 3 – устрымаліся. У адказ 8 жніўня 1923 г. Беларускі школьны аддзел звярнуўся з пратэстам у Дэпартамент самакіравання МУС Латвіі, назваўшы пастанову Краслаўскай гарадской думы парушэннем заканадаўства[308].

Вырашэнне лёсу Краслаўскай беларускай школы не знайшло хуткага фіналу. Паколькі краслаўскае самакіраванне не прадаставіла школе адпаведнага памяшкання, заняткі ў 1923/24 гг. не маглі пачацца[309]. 15 снежня 1923 г. Краслаўская гарадская дума на прапанову дэпутата-паляка Г. Шаркоўскага вырашыла зачыніць беларускую школу, што выклікала пратэст беларускага боку (9 студзеня 1924 г.). Ліквідацыя школы была абгрунтаваная тым, што з 51 запісанага вучня заняткі наведвалі толькі 30[310]. 10 красавіка 1924 г. Беларускі школьны аддзел пісаў міністру асветы з просьбай звярнуць увагу на школу, стаўленне да якой з боку мясцовай школьнай управы акрэслівалася як варожае[311]. Беларускі бок вінаваціў Лудзенскую павятовую школьную ўправу ў тым, што яна не прызначыла ў школу настаўніка латышскай мовы нягледзячы на шматлікія запыты і просьбы[312]. У жніўні 1924 г. гарадскія ўлады канчаткова пастанавілі закрыць школу, што выклікала чарговы пратэст беларусаў. У верасні 1924 г., у лісце міністру асветы, кіраўнік С. Сахараў называў пастанову гарадской думы незаконнай і прынятай "пад ціскам польскіх і габрэйскіх дэпутатаў"[313]. У выніку школа па-ранейшаму існавала, але не атрымлівала ад самакіравання ніякіх грошай. Беларускі актыў прасіў міністра альбо выдаткаваць на яе сродкі з дзяржаўнага бюджэту, альбо ператварыць школу ў паралельны клас у мясцовай латышскай школе. Беларускі бок адзначаў, што краслаўскае самакіраванне складаецца з "польскіх і габрэйскіх элементаў, якія чамусьці апазіцыйна ставяцца да беларускай школы"[314].

У выніку непаразуменняў вакол нацыянальнай прыналежнасці спрэчных школ Беларускі школьны аддзел страціў шэраг навучальных устаноў. Большасць з іх была перададзеная ў падпарадкаванне Агульнага школьнага

---

[308] LVVA, 2125 f., 5 ap., 146 l., 53 lp.; НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 43, л. 18–20.

[309] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 43, л. 24.

[310] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 45, л. 18.

[311] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 44, л. 7–8.

[312] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 45, л. 4.

[313] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 44, л. 16.

[314] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 44, л. 35.

дэпартамента. Цягам 1922/23 гг. такі лёс падзяліла 7 школ, у тым ліку 3 на Даўгаўпілшчыне і 4 на Лудзеншчыне[315]. У іх лік трапілі Пустынская, Наўлянская і 1-я Прыдруйская школы. Паводле рашэння латвійскіх школьных улад гэтыя школы перайшлі ў часовае (1-гадавое) падпарадкаванне Агульнага школьнага дэпартамента[316].

Беларускі бок намагаўся захаваць школы. 26 верасня 1922 г. Беларускі школьны аддзел накіраваў міністру асветы і кіраўніцтву Агульнага школьнага дэпартамента ліст, у якім адзначалася, што беларускія школы адчыніліся толькі ў мясцовасцях з перавагай беларускага насельніцтва. Дакумент утрымліваў пратэст супраць перадачы гэтых школ у падпарадкаванне іншых нацыянальных школьных аддзелаў, бо гэта магло стварыць небяспечны прэцэдэнт[317]. Інспектар беларускіх школ сцвярджаў, што, пераводзячы школы з вучнямі-беларусамі ў Агульны школьны дэпартамент, латышская адміністрацыя імкнецца павялічыць колькасць латышскіх школ коштам беларускіх. Адначасова ён не губляў надзеі на вяртанне прынамсі часткі ўстаноў. У кастрычніку 1922 г. ён прасіў кіраўніка Беларускага школьнага аддзела атрымаць згоду Агульнага школьнага дэпартамента на тое, каб інспектар беларускіх школ мог працягваць наведваць страчаныя школы[318]. Інспектар К. Езавітаў у лісце кіраўніку аддзела (13 кастрычніка 1922 г.) адзначаў: "*не вазражаючы супроць перадачы першых двух школ на адзін год у Агульны Дэпартамент, лічу меру гэтую адносна Прыдруйскай школы зусім непатрэбнай, бо, як я і раней папярэджваў, жыхарства тутака жадае беларускай школы. Найлепшым доказам гэтага служыць дадаваемая пры опісі заява бацькоў. А таму прашу зрабіць захады, каб школа гэтая была перададзена зноў у Беларускі Аддзел*"[319]. На просьбу К. Езавітава, 30 кастрычніка 1922 г. С. Сахараў скіраваў зварот у Агульны школьны дэпартамент з пытаннямі наконт таго, ці Беларускі школьны аддзел па-ранейшаму будзе мець нейкае дачыненне да вышэйзгаданых школ. У прыватнасці, беларускі бок цікавіўся, ці можна высылаць тым школам цыркуляры Беларускага школьнага аддзела, і ці змогуць іх наведваць інспектарам беларускіх школ. Падкрэслівалася, што гэтыя школы патрабуюць і надалей беларускай апекі, бо ў іх вучацца пераважна беларускія дзеці і выкладаецца беларуская мова. На думку кіраўніцтва Беларускага школьнага аддзела, у выпадку страты нагляду, існавала пагроза, што школы ператворацца ў рускія або польскія[320]. Адначасова С. Сахараў звярнуўся да міністра асвету з прапановай наладзіць працу школ такім

[315] LVVA, 2125 f., 5 ap., 333 l., 60–64 lpp.; НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 167, л. 9.

[316] LVVA, f. 2125, apr. 5, l. 42, 270, 277 lpp.

[317] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 43, л. 5–6.

[318] LVVA, 2125 f., 5 apr., 38 l., 501 lp.

[319] LVVA, f. 2125, apr. 5, l. 29, 46 lp.

[320] LVVA, 2125 f., 5 ap., 39 l., 50, 62 lpp.

чынам, каб у кожнай з іх працавала па адным настаўніку-беларусу, а беларуская мова выкладалася як абавязковы прадмет[321].

У наступныя гады колькасць беларускіх школ працягвала змяншацца. На пачатак 1924 г. у Агульны школьны дэпартамент было перададзена чарговыя 11 школ. У іх ліку знаходзіліся тры 6-класныя школы – у Старой Слабадзе, Пасіене і Індры. Гэтая страта азначала змяншэнне колькасці патэнцыйных кандыдатаў у сярэднія школы. У школы, якія апынуліся ў распараджэнні Агульнага школьнага дэпартамента, накіроўвалі настаўнікаў-латышоў, а беларусаў пераводзілі ў іншае месца. Праўда, нейкі час у іх яшчэ выкладалі беларускую мову. 16 верасня 1924 г. Беларускі школьны аддзел прасіў міністра асветы перагледзець рашэнне адносна шэрагу школ, якія апынуліся ў падпарадкаванні Агульнага школьнага дэпартамента. Таксама беларусы прасілі дапусціць да працы ў школах у Зілупе і Старой Слабадзе настаўнікаў-беларусаў, якія ведалі латышскую мову[322]. У іншым звароце С. Сахараў прасіў кіраўніцтва Агульнага школьнага дэпартамента, каб дырэктары перададзеных школ рэгулярна кантактавалі з Беларускім школьным аддзелам і давалі яму статыстычную інфармацыю пра нацыянальны склад вучняў[323].

Нягледзячы на цяжкасці і страту шэрагу школ, беларускі актыў з аптымізмам глядзеў у будучыню. У прыватнасці, С. Сахараў лічыў, што працэс стварэння беларускіх школ у Латвіі яшчэ не скончыўся. Ён планаваў ахапіць беларускай школьнай справай Ілукшчыну і Рэжыччыну[324]. Каб забяспечыць далейшае развіццё беларускай школьнай справы, С. Сахараў вызначаў нацыянальнаму актыву наступныя заданні: "*1. Выданне праграм, 2. Ладжанне летніх вучыцельскіх курсаў, 3. Выданне падручнікаў па беларусазнаўстве, 4. Абдзяленне школ падручнікамі, 5. Вызваленне беларускіх школ ад нежаданага вучыцельскага элементу, 6. Ладжанне экскурсій улетку для вучашчых і вучашчыхся, 7. Рупата аб адчыненні новых беларускіх школ, 8. Дагляд за школамі ў звязку з ліквідацыяй інстытуту інспектараў нацыянальных меншасцяў, 9. Дапамога бедным вучашчымся*"[325]. У наступныя гады кожны з гэтых пунктаў беларускі актыў намагаўся рэалізоўваць.

Беларускі школьны аддзел і інспектар беларускіх школ

Істотным элементам функцыянавання беларускай адукацыі былі ўстановы, якія адказвалі за каардынацыю дзейнасці школ і нагляд за іх працай. Нягледзячы на тое, што восенню 1921 г. у Латвіі пачалі працаваць

[321] LVVA, 2125 f., 5 ap., 39 l., 61 lp.
[322] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 44, л. 16.
[323] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 45, л. 7.
[324] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 167, л. 8.
[325] LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 67 lp.

першыя беларускія школы, беларусы не мелі школьнага аддзела ў складзе Дэпартамента нацыянальных меншасцей Міністэрстве асветы[326]. Пытанне пра стварэнне гэтай установы ўпершыню было ўзнята беларускім актывам у траўні 1921 г. Кіраўніцтва таварыства "Бацькаўшчына" звярнулася ў Міністэрства асветы з адпаведнай просьбай. Паводле К. Езавітава, фармальнай прычынай затрымкі з арганізацыяй аддзела была адсутнасць прадстаўніка беларускай меншасці ў латвійскім парламенце. Стварыць аддзел дапамог Яніс Райніс, які па просьбе таварыства "Бацькаўшчына" пагадзіўся прадстаўляць нацыянальна-культурныя інтарэсы беларускай меншасці[327]. Ад імя беларускага актыву 18 жніўня ён звярнуўся да міністра асветы Аляксандрса Даўгэ (*Aleksandrs Dauge*) з прапановай стварыць Беларускага школьнага аддзела (БША). Нягледзячы на крытычныя заўвагі дарадцы міністра Валерыі Сейле, 22 верасня 1921 г. Рада міністраў Латвійскай Рэспублікі пастанавіла стварыць Беларускі школьны аддзел *(Baltkrievu izglītības pārvalde)*. Установа знаходзілася ў Рызе па адрасе *Nikolaja iela* (з 1923 г. – *Krišjāņa Valdemāra iela*) *36a*).

Першапачаткова аддзел складаўся з кіраўніка, справавода і карэспандэнткі-перакладчыцы. Па рэкамендацыі актыву таварыства "Бацькаўшчына" кіраўніком быў прызначаны С. Сахараў. 18 кастрычніка 1921 г. ён афіцыйна ачоліў аддзел[328]. Кіраўнік аддзела падпарадкоўваўся міністру асветы і атрымаў 5-ю катэгорыю чыноўніка. Нізкая катэгорыя тлумачылася тым, што на момант стварэння БША было невядома, колькі школ будзе знаходзіцца ў яго падпарадкаванні. У снежні 1921 г. С. Сахараў прасіў міністра надаць

---

[326] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 110, л. 1.

[327] Латышскі пясняр асабіста ведаў Янку Купалу і небеспадстаўна лічыўся сябрам беларускага народа. Вось якім чынам К. Езавітаў згадваў размову з Я. Райнісам: "*Ян Райніс пад той час моцна нядужаў і адпачываў ад працы ў парку Дзіцячае Бальніцы на Мітаўскай шашы, дзе ў адным з будынкаў пасяліўся на лета. Ён уважліва і ўсхвалявана выслухаў маё апавяданне і, нарэшце, на маю просьбу каб ён згадзіўся зусім фармальна ўзяць на сябе абарону беларускіх меншасцёвых нацыянальна-культурных інатрэсаў у Латвійскім Устаноўчым Сойме, – адказаў: 'Добра! – я вазьмуся за гэтую справу і пастараюся дапамагчы вам!' Я паціснуў яго руку, шчыра падзякаваў за прыязнь і, папрасіўшы выбачэння за ўскладаныя на яго турботы, зараз-жа накіраваўся проста на вакзал. Праз два дні, 18 жніўня 1921 года, я ўжо прывёз яму ад Цэнтральнага Праўлення Т-ва 'Бацькаўшчына' з Дзвінску афіцыйную просьбу і ўпоўнаважанне абараняць інтарэсы беларускае меншасці ва ўсіх установах Латвійскае Рэспублікі (...) Ян Райніс прыняў гэта даручэнне і, нягледзячы на хворасць, тут жа накідаў праект афіцыйнае заявы на імя Міністра Асветы, у якой, асветліўшы са свайго боку становішча беларускае меншасці, паведамляў Міністра аб тым, што прыме абарону беларускіх культурна-асветных інтарэсаў на сябе і падтрымоўвае просьбу Т-ва 'Бацькаўшчына' аб стварэнні Беларускага Аддзела пры Міністэрстве Асветы*". К. Езавітаў, *Беларускае Культурна-Асьветнае Т-ва "Бацькаўшчына" ў Латвіі*, Рыга 1932, с. 13–14.

[328] К. Езавітаў, *Беларускае Культурна-Асьветнае Т-ва "Бацькаўшчына" ў Латвіі*, Рыга 1932, с. 14.

яму 3-ю катэгорыю, бо кіраўнікі іншых нацыянальных аддзелаў яе мелі[329]. На пасаду справавода быў прызначаны Ян Шчорс, былы школьны інспектар асноўных школ Віндаўскага раёна. Пасаду карэспандэнткі-перакладчыцы атрымала М. Барон. 1 студзеня 1922 г. аддзел быў павялічаны да чатырох работнікаў і атрымаў дадатковае фінансаванне. Пасада машыністкі-карэспандэнткі заняла Ніна Пінская. Забягаючы наперад, можна адзначыць, што 1 красавіка 1922 г. у аддзеле з'явіўся бухгалтар. Гэтую пасаду займаў латыш А. Кронберг. Спачатку канцылярыя аддзела займалася арганізацыйнай працай: складаннем бюджэту, ліставаннем з павятовымі школьнымі ўправамі па справах арганізацыі новых школ, зносінамі з кіраўнікамі школ у персанальных і педагагічных справах, працаўладкаваннем настаўнікаў і атрыманнем школьнага інвентара, арганізацыяй вучнёўскіх і настаўніцкіх экскурсій, кантактамі з беларускімі культурна-асветнымі арганізацыямі, супрацоўніцтвам з прэсай. У школьных пытаннях БША супрацоўнічаў з беларускай грамадскасцю, у тым ліку з культурна-асветнымі таварыствамі. У 1922–1923 гг. гэта было таварыства "Бацькаўшчына", з Даўгаўпілскай і Лудзенскай філіямі якога Беларускі школьны аддзел падтрымліваў рэгулярнае ліставанне[330].

Аддзел пачаў працу з пэўным спазненнем. Фактычная дзейнасць пачалася 1 лістапада 1921 г. Кастусь Езавітаў тлумачыў гэта тым, што С. Сахараў не адразу пагадзіўся заняць пасаду кіраўніка. Праз шэсць дзён (7 лістапада) кіраўніцтва аддзела выдала зварот да кіраўнікоў беларускіх школ, у якім паведамляла пра стварэнне аддзела і загадвала кантактаваць з ім па ўсіх школьных пытаннях[331]. Адначасова кіраўніцтва заклікала настаўнікаў да супрацоўніцтва і звяртала ўвагу на тое, што беларуская школа павінна быць сапраўдным сонцам асветы і нацыянальнай свядомасці сярод вясковай цямноты[332]. У звароце да кіраўнікоў і настаўнікаў беларускіх школ чытаем: "*Приступая к выполнению возложенных на него законом обязательностей, Отдел сознает всю трудность предстоящего строительства белорусских школ и всецело надеется на помощь и деятельную поддержку в этом отношении со стороны учительства. Между Отделом и учительством должно быть тесное отношение на почве общих интересов обучения и воспитания молодого поколения. Учительство в своей деятельности должно опираться на народ, оно не должно замыкаться в узкой сфере школьного обучения: белорусская школа должна быть тем солнцем среди деревенской темноты, которое своими теплыми лучами будет тянуть к себе всякого белоруса. Для этого Отдел настоятельно рекоменует учащим устраивать по воскрестным дням чтения и собеседования*

[329] LVVA, 2125 f., 5 apr., 18 l., 10, 24, 26 lpp.

[330] LVVA, 2125 f., 5 apr., 15 l., 22 lp.

[331] LVVA, 2125 f., 5 ap., 67 l., 16 lp.; НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 47, л. 1.

[332] LVVA, 2125 f., 5 ap., 67 l., 18 lp.

по вопросам, близко затрагивающим интересы деревни, читать газеты и книги, давать народу возможные советы, организовывать кружки белорусской молодежи, народные хоры, библиотеки, театры и т.п. Только таким путем, по твердому убеждению Отдела, учительство и школа могут завоевать себе прочные симпатии среди населения и быть крепким оплотом национального возрождения белорусского народа в Латвии. Приветствуя учительство, наботающее в белорусских школах, Отдел прызывает его к живой, бодрой, творческой школьной и внешкольной детельности на благо своего родного темного брата – белорусса и просит помнить, что то отныне в лице Отдела имеет твердого защитника его учительских интересов"[333].

Кіраўнік аддзела не прымаў рашэнняў аднаасобна. Пры БША існавала Рада. Пытанне пра яе стварэнне было разгледжана 25 лютага 1922 г. на пасяджэнні Даўгаўпілскага настаўніцкага актыву, на якім прысутнічаў С. Сахараў. Удзельнікі вырашылі, што орган будзе складацца з 3 прадстаўнікоў Даўгаўпілшчыны (2 – ад таварыства "Бацькаўшчына" і 1 – ад настаўніцтва) і 3 – Лудзеншчыны (1 – ад таварыства "Бацькаўшчына" і 2 – ад настаўніцтва). Сябры Рады павінны былі прадстаўляць таварыства "Бацькаўшчына", павятовае настаўніцтва і педагогаў гімназій і настаўніцкіх курсаў[334]. У працы органу маглі ўдзельнічаць толькі грамадзяне Латвіі. З гэтай прычыны некаторым кандыдатам не было дазволена ўвайсці ў Раду[335]. Сябры Рады прызначаліся тэрмінам на год, а старшынём органу быў кіраўнік БША. Першыя дзве Рады складаліся з прадстаўнікоў настаўніцтва Даўгаўпілшчыны і Лудзеншчыны, а таксама таварыства "Бацькаўшчына". У трэці склад увайшоў прадстаўнік навастворанага таварыства "Рунь"[336]. Падрабязнейшыя звесткі адносна персанальнага складу Рады БША пададзеныя ў табліцы.

Табліца 20. Склад Рады Беларускага школьнага аддзела ў 1922–1924 гг.

Імя, прозвішча	Прадстаўніцтва
Кадэнцыя 1922/23 гг.	
Сяргей Сахараў	Кіраўнік БША
Кастусь Езавітаў	Інспектар беларускіх школ
Іван Краскоўскі	Дырэктар Даўгаўпілскай урадавай беларускай гімназіі
Сымон Маціеўскі	Беларускае настаўніцтва Даўгаўпілскага павету
Рыгор Плыгаўка	Беларускае настаўніцтва Лудзенскага павету

[333] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 47, л. 3.

[334] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 112, л. 1; LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 47 lp.

[335] Гаворка ішла пра Паўліну Мядзёлку-Грыб і Аўгустына Дварэцкага. LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 10 lp.

[336] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 107, л. 24.

Імя, прозвішча	Прадстаўніцтва
Мікалай Хмялеўскі	Таварыства “Бацькаўшчына”
Іван Белікаў	Таварыства “Бацькаўшчына”
Кадэнцыя 1923/24 гг.	
Сяргей Сахараў	Кіраўнік БША
Кастусь Езавітаў	Інспектар беларускіх школ
П. Стэймакоў	Лудзенскі аддзел таварыства “Бацькаўшчына”
Іван Краскоўскі	Дырэктар Даўгаўпілскай урадавай беларускай гімназіі
Феліцыян Астроўскі	Беларускае настаўніцтва Даўгаўпілскага павету
Рыгор Плыгаўка	Беларускае настаўніцтва Лудзенскага павету
Андрэй Якубецкі	Таварыства “Бацькаўшчына”
Уладзімір Пігулеўскі	Таварыства “Бацькаўшчына”
Кадэнцыя 1924/25 гг.	
Сяргей Сахараў	Кіраўнік БША
Рыгор Плыгаўка	Лудзенскі аддзел таварыства “Бацькаўшчына”
Уладзімір Пігулеўскі	Даўгаўпілскі аддзел таварыства “Бацькаўшчына”
Ян Шчорс	Таварыства “Рунь”
Феліцыян Астроўскі	Беларускае настаўніцтва Даўгаўпілскага павету
Вільгельм Зянкевіч	Беларускае настаўніцтва сярэдніх школ

Крыніца: LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 1 lp.; LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 80 lp.; LVVA, 2125 f., 5 apr., 8 l., 6 lp.; НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 107, л. 24.

Першае пасяджэнне Рады адбылося 15 ліпеня 1922 г. Падчас яго кіраўнік Беларускага школьнага аддзела азнаёміў прысутных з Законам аб адукацыі (8 снежня 1919 г.) і прадставіў справаздачу з дзейнасці аддзела ў 1921/22 гг.[337] Важным было пасяджэнне 21 красавіка 1923 г., на якім вызначалі другі склад гэтага органу на 1923/24 гг.[338]

Удзел у пасяджэннях Рады з’яўляўся справай ганаровай, якая не аплачвалася. Пасяджэнні Рады адбываліся ў Рызе, але большасць сяброў жылі ў Латгаліі і мусілі наведваць сталіцу за ўласны кошт. Не ўсе былі ў стане гэта рабіць, таму Рада апынулася ў сітуацыі, калі не магла склікаць пасяджэнняў з прычыны адсутнасці кворуму[339]. Каб выправіць сітуацыю, 28 верасня 1922 г. кіраўнік БША прасіў Міністэрства асветы выдаткаваць сродкі на службовыя камандзіроўкі сяброў Рады[340]. Аднак бюджэт аддзела не

[337] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 2 lp.

[338] LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 80 lp.; LVVA, 2125 f., 5 apr., 8 l., 6 lp.

[339] LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 19 lp.

[340] LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 24 lp.

прадугледжваў падобных выдаткаў, таму дзеля пакрыцця коштаў падарожжа дэлегатаў кіраўніцтва БША ўвяло настаўніцкую складку ў памеры 100 латвійскіх рублёў з асобы[341].

Пасяджэанні Рады адбываліся ў залежнасці ад патрэбы. Разам у перыяд з ліпеня 1922 па лістапад 1924 гг., а потым са жніўня 1926 па красавік 1934 гг. адбылося 50 пасяджэнняў (12 – у 1922–24 г. і 38 – у 1926–34 г.). Дынаміка склікання пасяджэнняў выглядала наступным чынам: у сярэднім яны адбываліся 3–4 разы на год з выключэннем 1922 года (1 раз), 1924 і 1934 гг. (2 разы), а таксама ў 1927 г. (6 разоў) і ў 1928 г. (9 разоў).

Завяршэннем працэсу стварэння беларускіх школьных устаноў было ўвядзенне на пачатку 1922 г. пасады інспектара беларускіх школ (*Baltkrievu skolu inspektors*)[342]. Інспектар прызначаўся міністрам па рэкамендацыі Беларускага школьнага аддзела. Згодна з прапановай апошняга, 18 студзеня 1922 г. міністр асветы зацвердзіў кандыдатуру К. Езавітава[343]. Сядзіба інспектара знаходзілася ў Даўгаўпілсе па адрасе *Oficieru iela 24/3*. Да абавязкаў інспектара належаў агульны нагляд за працай беларускіх пачатковых школ. Інспектар не рабіў гэтага без узгаднення з мясцовымі школьнымі ўладамі, паколькі школы нацменаў мусілі кантраляваць і агульныя школьныя інспектары адпаведных рэгіёнаў, якія ажыццяўлялі нагляд за выкладаннем латышскай мовы, гісторыі і геаграфіі Латвіі[344]. Сваімі назіраннямі і заўвагамі беларускі школьны інспектар мусіў дзяліцца з адпаведнымі мясцовымі школьнымі ўправамі – Даўгаўпілскай ці Лудзенскай. У выпадку, калі інспектар і школьная ўправа мелі разыходжанні ў ацэнцы дзейнасці школ, справай мусіла заняцца Міністэрства асветы. Згодна з заканадаўствам, ліставанне інспектара з урадавымі ўстановамі і органамі самакіравання адбывалася дзяржаўнай мовай. Тым часам, у карэспандэнцыі паміж інспектарам, школамі і БША магла выкарыстоўвацца беларуская мова[345]. У сваю чаргу, ліставанне па гаспадарчай частцы (прыбыткі, выдаткі) паміж усімі вышэйзгаданымі ўстановамі мусіла ажыццяўляцца па-латышску[346].

З'яўленне пасады інспектара палепшыла сувязь паміж Беларускім школьным аддзелам і школамі. Інспектар асабіста наведваў школы і дакладваў кіраўніку БША пра вынікі інспекцый. К. Езавітаў не мог наракаць на адсутнасць працы. Са справаздач кіраўніка аддзела вынікае, што на працягу 1921/22 гг. ён наведаў большасць беларускіх школ Даўгаўпілшчыны і Лудзеншчыны, узяў

---

341 LVVA, 2125 f., 5 apr., 8 l., 12 lp.

342 LVVA, 1612 f., 14 apr., 11 l., 24 lp.

343 НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 47, л. 6.

344 LVVA, 2125 f., 5 ap., 2 l., 80 lp.

345 НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 107, л. 26; LVVA, 2125 f., 5 ap., 2 l., 50 lp.

346 LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 66 lp.

удзел у 25 пасяджэннях павятовых і гарадскіх школьных упраў, 4 настаўніцкіх канферэнцыях з рэфератамі пра беларускую школу і 5 раз быў выкліканы ў Рыгу дзеля дакладу пра становішча беларускіх школ у Латгаліі[347]. Арганізацыйныя справы патрабавалі шмат часу і энергіі, таму інспектар не заўсёды меў магчымасці трымацца бюракратычных працэдур. 13 чэрвеня 1922 г. кіраўніцтва Беларускага школьнага аддзела нагадвала К. Езавітаву, што ўсе фінансавыя падрахункі ён павінен рабіць на латышскай мове, а таксама рэгулярна весці дзённік са звесткамі аб камандзіроўках[348].

Інспектар уваходзіў у склад Рады БША з правам вырашальнага голасу. 15 ліпеня 1922 г. Рада Беларускага школьнага аддзела прызначыла К. Езавітава намеснікам кіраўніка гэтага органа[349]. Ён працаваў на пасадзе беларускага школьнага інспектара ў перыяд, калі ішоў працэс фарміравання сеткі беларускіх школ. У сувязі з гэтым напрыканцы 1922 г. Міністэрства асветы дало К. Езавітаву права інструктаваць беларускія школы Лудзеншчыны па прадмету беларусазнаўства[350].

Супрацоўніцтва паміж Беларускім школьным аддзелам і беларускім школьным інспектарам было добрым, але не без супярэчнасцей. У прыватнасці, К. Езавітаў быў вельмі патрабавальны да працы БША. Ён крытычна ацэньваў працу аддзела ў галіне пашырэння сярод латвійскага грамадства інфармацыі пра стан беларускай культурна-асветнай працы. Дакараў кіраўніцтва БША, што яно месяцамі не рупілася перакласці яго артыкулы пра Яўхіма Карскага і Максіма Гарэцкага, а таксама пра беларускія школы ў Латвіі. К. Езавітаў лічыў, што замест гэтага кіраўніцтва аддзела марнавала час і высілкі на малаістотныя справы. Ён крытычна ставіўся да працы справавода Я. Шчорса, вінавацячы яго ў некампетэнтнасці і адсутнасці арыентацыі ў становішчы беларускіх школ[351]. Акрамя таго, інспектару не падабалася, што ў першыя гады існавання Беларускага школьнага аддзела службовае ліставанне (у тым ліку – выданне цыркуляраў да настаўніцтва) адбывалася па-руску. У звароце да кіраўніка Беларускага школьнага аддзела ад 6 красавіка 1923 г. К. Езавітаў пісаў: "*Прашу срочнага загаду вашага, каб у Беларускім аддзеле была чутна, нарэшце, беларуская мова, бо наш аддзел ужо робіцца прытчай ва языках на местах, ды і ў самім міністэрстве. Асабліва важна гэта для пасеціцеляў з правінцыі, якія дужа бываюць здзіўлены, калі ў нашым аддзеле з імі гутараць на расейскай мове*"[352].

---

[347] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 110, л. 3.

[348] LVVA, 2125 f., 5 apr., 42 l., 86 lp.

[349] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 107, л. 46; LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 1 lp.

[350] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 48, л. 37.

[351] LVVA, 2125 f., 5 apr., 256 l., 35 lp.

[352] LVVA, 2125 f., 5 ap., 18 l., 31 lp.

Пасада інспектара беларускіх школ праіснавала нядоўга. 5 лютага 1923 г. Міністэрства асветы скасавала (з 1 сакавіка) пасады інспектараў некаторых нацыянальных меншасцей, а іх абавязкі па наглядзе за працай школ усклала на адпаведныя павятовыя школьныя ўправы і інспектараў асноўных школ. Было вырашана захаваць інспектараты габрэйскіх, рускіх і нямецкіх школ. Утрыманне апошняга ўзяла на сябе нямецкая грамадскасць[353]. Канчатковая ліквідацыя пасады інспектара беларускіх школ адбылася 31 сакавіка 1923 г.[354] У сувязі з гэтым К. Езавітаў здаў інвертар і канцылярыю ў Лудзенскую беларускую гімназію. Разам з тым ён па-ранейшаму заставаўся намеснікам кіраўніка Беларускага школьнага аддзела і браў удзел у пасяджэннях яго Рады[355].

З моманту ліквідацыі пасады інспектара беларускія школы ў Латгаліі былі пазбаўленыя непасрэднага кантакту з Беларускім школьным аддзелам, які знаходзіўся ў Рызе. Беларускі бок лічыў такое становішча непажаданым і шкодным. У сувязі з гэтым БША рабіў захады, каб рашэнне аб скасаванні пасады беларускага школьнага інспектара было адменена. 20 красавіка 1923 г. на прапанову К. Езавітава Рада Беларускага школьнага аддзела звярнулася да міністра асветы з просьбай вярнуць пасаду інспектара беларускіх школ[356]. 30 красавіка 1923 г. сход настаўнікаў Прыдруйскай і Пустынскай валасцей падтрымаў ініцыятыву Рады БША і прапанаваў кандыдатуру К. Езавітава на пасаду інспектара[357]. 9 траўня 1923 г. Беларускі школьны аддзел зноў звярнуўся да міністра асветы з просьбай аднавіць пасаду інспектара беларускіх школ з правам голасу ў школьных управах. Сваю просьбу беларускі бок абгрунтоўваў тым, што беларускія школы працуюць у складаных умовах (адсутнасць досведу, нізкі ўзровень нацыянальнай свядомасці беларускага насельніцтва, напады з боку рускіх, палякаў і латгальскіх дзеячаў). У звароце адзначалася, што адсутнасць беларускага інспектара пры захаванні інспектараў рускіх, габрэйскіх і нямецкіх школ дае праціўнікам дадатковыя падставы называць беларускія школы штучнай з'явай. Больш за тое, кіраўніцтва БША лічыла, што па меры пашырэння нацыянальнай свядомасці латвійскіх беларусаў узнікне патрэба арганізацыі новых беларускіх школ[358]. Беларускія просьбы не былі, аднак, задаволены латвійскімі ўладамі. Тады беларускі актыў паспрабаваў атрымаць дазвол Міністэрства асветы калі не на аднаўленне пасады інспектара, дык на стварэнне пасад інструкта-

[353] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 45, л. 31.
[354] LVVA, 5213 f., apr. 16, 16514 l., 3 lp.
[355] LVVA, 2125 f., 5 apr., 84 l., 32 lp.
[356] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 8 lp.
[357] LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 90 lp.
[358] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 43, л. 16–17.

раў беларускіх школ. 26 ліпеня 1924 г. Рада Беларускага школьнага аддзела прасіла міністра асветы зацвердзіць на гэтых пасадах настаўнікаў П. Жэрдзі (на Даўгаўпілшчыне), У. Пігулеўскага і Р. Плыгаўку (на Лудзеншчыне). Аднак улады ў Рызе не бачылі патрэбы ў такіх зменах[359].

Настаўніцкія курсы

Істотнай праблемай, якая стаяла перад маладой беларускай школьнай справай у Латвіі, была малалікасць кваліфікаваных настаўніцкіх кадраў. Мясцовая беларуская інтэлігенцыя была нешматлікая, што не магло не ўплываць на школы. Падрыхтоўка прафесійных кадраў была адным з прыярытэтаў дзейнасці мясцовага беларускага актыву. Першапачатковыя планы звярнуцца да латвійскіх улад па дазвол на стварэнне беларускай настаўніцкай семінарыі давялося змяніць, бо ўлады ў Рызе не пайшлі б на такі крок. Перавагу аддалі падрыхтоўцы кадраў шляхам арганізацыі летніх педагагічных курсаў для асоб з сярэдняй асветай. Таварыства "Бацькаўшчына" правяло рэгістрацыю дыпламаваных настаўнікаў-беларусаў, якія скончылі расійскія інстытуты і семінарыі, 8-класныя жаночыя вучылішчы або вытрымалі іспыты, атрымаўшы ад латвійскіх улад права займацца педагагічнай дзейнасцю. Як узгадвае К. Езавітаў, такіх набралася шмат, але яны не маглі працаваць у беларускіх школах, бо не валодалі беларускай літаратурнай мовай і ведамі па беларусазнаўстве. 28 ліпеня 1921 г. міністр асветы выдаў загад пра стварэнне ў Даўгаўпілсе 6-тыднёвых беларусазнаўчых курсаў для настаўнікаў. Кіраўніком быў прызначаны інспектар пачатковых школ Даўгаўпілскага павета Лукас Азоліньш. Ён адказваў за гаспадарчую частку, а лектарамі былі Кастусь Езавітаў і Ігнат Дварчанін. Апошняга К. Езавітаў выклікаў з Вільні. Слухачамі на курсы запісаліся 73 настаўнікі, якія выказалі жаданне працаваць у беларускіх школах[360]. Сярод іх трапляліся выпадковыя людзі, але былі і тыя, хто ў наступныя гады плённа працаваў на карысць беларускай школьнай справы і беларускіх грамадска-культурных арганізацый. Сярод апошніх варта згадаць Язэпа Камаржынскага, Яўгена Красневіча, Алеся Махноўскага, Феліцыяна Астроўскага і інш. Праграма курсаў складалася з лекцый па гісторыі Беларусі, гісторыі беларускай літаратуры, гісторыі беларускага адраджэння, геаграфіі Беларусі, беларускай мовы. Большасць курсантаў, паступаючы на курсы, не ведала беларускай граматыкі. Каб зацікавіць курсантаў мінулым свайго народу, К. Езавітаў пазычыў у Рыжскай гарадской бібліятэцы кнігі на гістарычную тэматыку (*Грамоты, касающияся до сношений Северо-Западной России с Ригой*

[359] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 8 lp.

[360] К. Езавітаў, *Беларускае Культурна-Асьветнае Т-ва "Бацькаўшчына" ў Латвіі*, Рыга 1932, с. 6, 8.

и Ганзейскими городами", *Русско-Ливонские Акты*, *Das Rigische Schuldbug*) і зладзіў выставу[361].

Курсы пачалі працу, маючы недастатковы бюджэт. Латвійскія ўлады прызначылі на іх дзейнасць толькі 5 тыс. рублёў. У жніўні 1921 г. К. Езавітаў інфармаваў В. Ластоўскага, што ён з асабістых сродкаў аплачвае лектарскую працу І. Дварчаніна[362]. У лісце (4 жніўня 1921 г.) ён пісаў прэм'еру ўраду БНР: "*Курсы – адчынены. Працуюць добра. У прэсу аб гэтым даваць не трэба, бо спалохаюцца палякі і пачнуць інтрыгі і проці мяне, і проці Дварчаніна. Курсантаў штодня – больш. Сённека атрымаў Дзвінскі спісак у 60 чалавек*"[363]. Тым часам, А. Галавінскі пісаў В. Ластоўскаму: "*У латышоў* [латвійскіх беларусаў – ЕГ] *настрой не кепскі да нас. Езавітаў працуе па арганізацыі асветы. У Дзвінску існуюць курсы, на якіх 45 вучыцялёў слухаюць лекцыі Дварчанінава па беларусазнаўству. Костусь крыўдзіцца, што не ўспамінаюць аб яго патрэбах. Між іншым, ён просіць даставіць яму кніжкі 'Беларусы і палякі'. За гэтую кніжку ён мог бы атрымліваць грошы. Зараз у Латгаліі вельмі патрэбна адчыніць курсы для вучыцялёў. У Люцыне – 4 чалавекі. Крэслаўцы – 25 чалавек. На гэтую справу па маёй думцы трэ' звярнуць увагу. Костусь шмат страціў на арганізацыю школьнай справы, яна амаль што зусім наладжана. Асігноўкі на курсы ад Латвійскага ўраду мажліва чакаць толькі па восені, цяперака ж трэба скарыстаць вольнае лета вучыцялёў. Костусь прасіў зазначыць, што ён доўгі час не атрымлівае пражытачнага мінімуму*"[364]. Нягледзячы на складанасці, курсы працавалі. 9 жніўня 1921 г. К. Езавітаў наступным чынам характарызаваў стан курсантаў: "*На курсах у Дзвінску ўжо слухаюць 60 слухачоў. Пазаўчора, учора і сённека прыехалі яны аглядаць выстаўку. Настрой добры. А тут яшчэ паддаў духу і ахвоты Архібіскуп усяе Латвіі Іаан (праваслаўны), які адслужыў для экскурсантаў вячэрню, сказаў добрую прамову аб Беларусі і правазгласіў за беларускі і латышскі народ 'Многая лета'. Некаторыя спявалі 'Многая лета' не толькі з дрожжу ў голасе, але, нават, са слязой*"[365].

Курсы скончыліся 15 жніўня, калі 20 курсантаў атрымала права працаваць настаўнікамі беларускіх пачатковых школ. Кастусь Езавітаў адзначаў, што хоць і ў экспрэсавым тэмпе, але ўсё ж гэтыя людзі былі падрыхтаваны да працы ў беларускіх школах. Ён лічыў, што іх "можна ўжо было скарыстаць для пачатку працы ў школах"[366]. У лісце (8 верасня 1921 г.) А. Цвікевічу

---

[361] LVVA, 2125 f., 5 apr., 38 l., 278 lp.

[362] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1167.

[363] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1168.

[364] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1169.

[365] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1173.

[366] К. Езавітаў, *Беларускае Культурна-Асьветнае Таварыства "Бацькаўшчына" ў Латгаліі і ягоная роля ў справе стварэньня беларускае школы ў Латвіі*, "Беларуская Школа ў Латвіі"

адзначаў, што настаўніцкія курсы прайшлі ўдала і ўсе ўдзельнікі раз'ехаліся па хатах ва ўзнёслым настроі[367]. Курсы дазволілі адчыніць 16 беларускіх школ у Прыдруйскай і Пустынскай валасцях на Дзвіншчыне. Выпускнікі занялі пасады кіраўнікоў гэтых школ[368].

Беларускі актыў рабіў спробы арганізаваць настаўніцкія курсы для настаўнікаў Лудзенскага павета. Аднак з прычыны адсутнасці сродкаў праца на Лудзеншчыне абмежавалася арганізацыяй у верасні 1921 г. гутарак-лекцый з асобнымі настаўнікамі на тэму беларускага нацыянальнага адраджэння. Адсутнасць курсаў К. Езавітаў лічыў шкодным недаглядам для развіцця беларускай школьнай працы ў Лудзенскім павеце[369].

Патрэба падрыхтоўкі педагогаў прымусіла Беларускі школьны аддзел адкрыць гадавыя настаўніцкія курсы. 10 лістапада 1921 г. кіраўніцтва Беларускага школьнага аддзела звярнулася да кіраўніка таварыства "Бацькаўшчына" з заклікам далучыцца да арганізацыі гэтых курсаў. Адначасова БША рабіў адпаведныя захады перад Міністэрствам асветы. У выніку 1 снежня 1921 г. у Даўгаўпілсе пачалі працу Беларускія гадавыя настаўніцкія курсы (*Baltkrievu skolotāju viengadīgi kursi*). Яшчэ 12 лістапада 1921 г. кіраўніцтва БША звярнулася да Сымона Рак-Міхайлоўскага з прапановай узяць на сябе абавязкі кіраўніка курсаў, а таксама лектара беларускай мовы, гісторыі і геаграфіі[370]. Пасля адмовы заходнебеларускага дзеяча пасада кіраўніка была даручаная К. Езавітаву. Апошні займаў яе са снежня 1921 да студзеня 1922 гг. Яго змяніў Эдвард Будзька, які прыбыў у Латвію з Літвы. Восенню 1922 г. курсы пераехалі ў будынак Даўгаўпілскай беларускай гімназіі[371].

На курсы маглі паступаць асобы, не маладзейшыя за 17 гадоў. Тыя, хто меў 6-гадовую сярэднюю асвету, прымаліся без іспытаў. Астатнія кандыдаты мусілі вытрымаць уступны іспыт. Набор адбываўся па лініі таварыства "Бацькаўшчына". У 1922 г. на курсы былі прынятыя 52 кандыдаты (з якіх 48 пачалі навучанне), а 13 было адмоўлена. Большую частку курсантаў склалі выпускнікі першага выпуску Даўгаўпілскай беларускай

1932, № 1(11), с. 148–150; К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, Рыга 1927 [перадрук: Нью-Ёрк – Менск 2013, с. 60, 100.

[367] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1211.

[368] К. Езавітаў, *Беларускае Культурна-Асьветнае Т-ва "Бацькаўшчына" ў Латвіі*, Рыга 1932, с. 6–9; К. Езавітаў, *Становішча беларускае школы ў Латвіі*, Вільня 1923, с. 13.

[369] К. Езавітаў, *Беларускае Культурна-Асьветнае Таварыства "Бацькаўшчына" ў Латгаліі і ягоная роля ў справе стварэньня беларускае школы ў Латвіі*, "Беларуская Школа ў Латвіі" 1932, № 1(11), с. 151; К. Езавітаў, *Беларускае Культурна-Асьветнае Т-ва "Бацькаўшчына" ў Латвіі*, Рыга 1932, с. 10.

[370] LVVA, 2125 f., 5 ap., 343 l., 4 lp.

[371] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 110, л. 14; К. Адраджэнец, *Выпускны Акт на Беларусіх Дзяржаўных Вучыцельскіх Курсах*, "Беларуская Школа ў Латвіі" 1932, № 3(13), с. 181.

гімназіі[372]. З часам лічба курсантаў зменшылася. У 1922/23 гг. на курсах выкладала 5 лектараў (Кастусь Езавітаў, Эдвард Будзька, Ігнат Дварчанін, Максім Гарэцкі, Паўліна Мядзёлка-Грыб), якія вучылі 21 курсанта (12 мужчын і 9 жанчын)[373].

Сярод прадметаў былі: беларуская мова і літаратура, гісторыя і геаграфія Беларусі, латышская мова, методыка выкладання мовы, педагогіка. З практычных заняткаў былі: кааператыўная справа, пераплётнае рамяство, арганізацыя народных хораў і тэатру, гімнастыка з гульнямі[374]. На курсах чыталі таксама методыку выкладання роднай мове[375]. Арганізатары забяспечылі інтэрнатам курсантаў, якія паходзілі з правінцыі. Інтэрнат знаходзіўся ў будынку сельскагаспадарчай школы[376]. 26 студзеня 1922 г. педагагічная рада курсаў прасіла БША выдаткаваць сродкі на ўтрыманне інтэрнату, бо незаможныя курсанты не былі ў стане гэтага рабіць, а ў выпадку яго закрыцця мусілі б кінуць навучанне і вярнуцца дахаты[377].

Пачаткі дзейнасці курсаў былі цяжкімі. Лектарка П. Мядзёлка-Грыб узгадвала: "*Крыху боязна было выступаць перад настаўнікамі ў ролі лектара, тым больш, што дапаможнікаў для падрыхтоўкі амаль зусім не было, калі не лічыць 'Гісторыі беларускай літаратуры' Максіма Гарэцкага. Праграмы таксама не было – трэба было самой складаць, а раіцца не было з кім*"[378]. Курсанты мелі магчымасць на практыцы выпрабоўваць атрыманыя веды. Увесну 1922 г. пры курсах была створаная прыкладная школа, якую наведвала 37 вучняў. Пэўнае ўяўленне наконт акалічнасцей адкрыцця школы дае ліст К. Езавітава (25 красавіка 1922 г.) да кіраўніка Беларускага школьнага аддзела, у якім чытаем: "*Перасылаючы пры гэтым паперу Т-ва 'Бацькаўшчына' ад 25 красавіка, № 74, са спіскам беларускіх дзетак, бацькі якіх жадаюць каб яны вучыліся ў Беларускай школе, а таксама і заявы бацькоў, пададзеных асабіста мне, прашу распараджэння Вашага аб адчыненні Абразцовае Беларускае Школы пры Беларускіх Вучыцельскіх Курсох у горадзе Дзвінску і аб назначэнні на пасаду Кіраўніка яе Гр. Андрэя Якубецкага, які ўжо пастановай Ураду Латвіі дапушчаны да ўезду ў Латвію і да заняцця гэтае пасады. Дадатак: 1) спісак 37 дзетак, прадстаўлены Т-вам 'Бацькаўшчына' і 2) заявы аб 19 дзетках, пададзены мне, усяго заяў на 46 дзетак*"[379]. 12 траўня 1922 г. у школе пачаліся заняткі[380].

---

[372] LVVA, 2125 f., 5 ap., 343 l., 106–107 lpp.
[373] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 107, л. 2.
[374] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 107, л. 2.
[375] LVVA, 6845 f., 2 ap., 3 l., 46 lp.
[376] LVVA, 2125 f., 5 ap., 343 l., 3 lp.
[377] LVVA, f. 2125, apr. 5, l. 38, 42 lp.
[378] П. Мядзёлка, *Сцежкамі жыцця*, Менск 2018, с. 319.
[379] LVVA, 2125 f., 5 ap., 176 l., 2 lp.
[380] LVVA, 2125 f., 5 ap., 38 l., 148 lp.

Курсы змагаліся з нястачай сродкаў. 2 красавіка 1922 г. К. Езавітаў звяртаў увагу С. Сахарава на тое, што курсы не атрымалі ніякай дапамогі і лічыў гэта вынікам занядбання з боку апошняга[381]. 23 траўня 1922 г. К. Езавітаў роспачна заклікаў кіраўніка БША знайсці фінансаванне: "*Маю гонар прасіць вас ужыць УСІХ крокаў і спосабаў, каб абавязкова дабіцца адпусткі грошай на Беларускія Вучыцельскія Курсы ў Дзвінску, бо калі мы не зможам іх закончыць, дык мы ніколі не будзем мець сапраўды беларускіх вучыцялёў, і школа наша будзе ў руках нацыянальна несвядомага вучыцельства. Адмаўленне ў водпуску некалькіх тысяч на падрыхтоўку самага важнага для нашай працы – беларускага вучыцельства – мяне надта дзівіць. Калі ў нас не будзе нацыянальна падрыхтаванага вучыцельства, дык нашто тады нам нашы школы і хто ў іх будзе вучыць. Калі-ж шкада грошай на курсы для вучыцялёў, дык зачым тады водпускі і на гімназіі, і на школы. Без падрыхтаваных вучыцялёў гэтыя грошы – дарэмна выкінуты*"[382].

Нястача сродкаў паставіла пад пагрозу далейшае існаванне курсаў. Увесну 1922 г. частка лектараў пагражала спыніць працу, калі не атрымае падвышкі. Гаротнае становішчы К. Езавітаў тлумачыў бяздзейнасцю Беларускага школьнага аддзела. Часткова святло на справу кідае ліст К. Езавітава кіраўніку БША: "*Гэтым маю гонар паведаміць, што сабраныя мной для працы на Беларускіх Вучыцельскіх Курсах беларускія педагагічныя сілы – пачынаюць раз'язджацца з Дзвінску і к началу новага вучэбнага года мы можамо зноў апынуцца без вучыцялёў-беларусаў, а гэта павядзе да полнага правалу ўсёй, з гэткім цяжкім трудом наладжанай, працы. Прычыны ад'езду гэткія: 1) вызываючы людзей, я абяцаў ім, ды і Вы пацвердзілі, што з новага бюджэтнага года (з I-IV-22) яны будуць зацверджаны на пасадах вучыцялёў Беларускае Гімназіі, што дасць ім магчымасць працаваць і жыць; абяцанне гэта да гэтага часу не споўнена і адзіным срэдствам да жыцця іх астаюцца Беларускія Вучыцельскія Курсы, 2) на жаль, за працу на гэтых курсах пенсія ўжо другі месяц не выплачваецца, бо Аддзел да гэтага часу не дабіўся ўключэння Беларускіх Вучыцельскіх Курсаў у бюджэт і не адшукаў ніякіх крыніц для аплаты лектарскай працы (красавік і травень – лектары працуюць, не атрымліваючы грошай)*"[383]. Аўтар прасіў як мага хутчэй заплаціць лектарам з Вільні і Коўна[384]. Ён заклікаў, каб Беларускі школьны аддзел уладкаваў іх на працу ў Даўгаўпілскую беларускую гімназію: М. Гарэцкага – настаўнікам беларускай мовы і гісторыі беларускай літаратуры, Э. Будзьку – справаводам. Адначасова прапаноўваў, каб кіраўніцтва гімназіі вылучыла сродкі на

[381] LVVA, 2125 f., 5 ap., 38 l., 50 lp.
[382] LVVA, 2125 f., 5 ap., 38 l., 114 lp.
[383] LVVA, 2125 f., 5 ap., 343 l., 104 lp.
[384] LVVA, 2125 f., 5 ap., 38 l., 165 lp.

аплату працы астатніх лектараў. У выпадку невыканання гэтых патрабаванняў К. Езавітаў заяўляў, што складзе з сябе адказнасць за развал беларускіх курсаў[385].

Але Беларускі школьны аддзел не спяшаўся вырашаць фінансавыя праблемы курсаў, і К. Езавітаў працягваў "бамбардаваць" яго роспачнымі лістамі. 30 траўня 1922 г. ён пісаў: "*23 траўня, паперай № 122, я папярэдзіў Аддзел аб цяжкім грашовым становішчы беларускіх лектараў, прыехаўшых працаваць у Дзвінск з Вільні і Коўна, дзе кінулі яны свае пасады, больш выгодныя і спакойныя, каб дапамагчы нашым культурным начынанням (...) Калі я пазнаёміў з лістамі гэтымі беларускіх лектараў, мне справядліва было адзначана, што кожны з іх ужо ўсё жыццё сваё ахвяраваў народу беларускаму і ні ў якіх парадах гэтага кірунку не нуждаецца; апрача таго, указана мне было і на тое, што яны ўжо некалькі месяцаў 'жэртвуюць' сабой тутака і на далейшыя жэртвы ў іх не хапае фізічных сілаў. Усе яны сямейныя людзі, жывуць на два домы і пастаўлены Аддзелам у такія варункі, што змушаны весці паўгалодны образ жыцця. Найбольш цяжкае грашовае становішча Грам. Будзькі, які працуе ў гэткіх варунках ужо паўгода і калі да 31 траўня не будзе змены ў яго становішчы, дык ён адмаўляецца ад працы і ад'язджае ў Вільню*"[386]. Так і не дачакаўшыся вырашэння пытання, кіраўнік курсаў Э. Будзька 31 траўня 1922 г. адмовіўся ад выканання сваіх абавязкаў і вярнуўся ў Вільню. Новым кіраўніком стаў Андрэй Якубецкі[387].

У складаным матэрыяльным становішчы знаходзіліся не толькі лектары, але і курсанты. Многія з іх патрабавалі тэрміновай дапамогі, бо працяглы час былі беспрацоўнымі. Сведчаць пра гэта шматлікія звароты да кіраўніцтва курсаў. У лютым 1922 г. просьбы пра дапамогу скіравалі Алесь Махноўскі, Эдуард Дзідзеля, Васіль Руднікаў, Вільгельм Мірановіч, Ванда Паланевіч, Клара Багінская, Пелагея Клюшкова, Люцыя Габран, Франц Клагіш і Віктар Рацін. У наступным месяцы гэта зрабілі Канстанцін Александровіч, Язэп Камаржынскі, Зінаіда Маліноўская і Сафія Кудраўцова[388]. У лісце Пелагеі Клюшковай чытаем: "*Прашу, калі ласка, выстарацца мне якую-небудзь падмогу, бо маё палажэнне вельмі цяжкае. Бацькі мае не маюць гаспадаркі і працаваць яны не могуць, бо ўжо стары і хворы. Яны не маюць ніякіх дастаткаў вучыць мяне і яшчэ двух малых сясцёр, а падмогі ніскуль не маюць. Зважаючы на гэта, прашу не адказаць у маёй просьбе*"[389]. А вось што пісала Клара Багінская (23 лютага 1922 г.): "*Прашу зрабіць ласку і выдаць мне*

[385] LVVA, 2125 f., 5 ap., 343 l., 105 lp.
[386] LVVA, 2125 f., 5 ap., 69 l., 30 lp.
[387] LVVA, 2125 f., 5 ap., 343 l., 113 lp.
[388] LVVA, 2125 f., 5 ap., 392 l., 30, 80 lpp.
[389] LVVA, 2125 f., 5 ap., 392 l., 89 lp.

якую-небудзь падмогу, бо находжусь у вельмі цяжкім палажэнні. Я круглая сірата, жыву ў зусім чужых людзёх, каторыя такжэ не маюць ніякіх сродкаў да жыцця. Працаваць яны не могуць, бо ўжо старыя, а памогі ніадкуль ня маюць. Усё, што было, пражылі, быўшы яшчэ бежанцамі, а цяпер, прыехаўшы да Бацькаўшчыны, няма як жыць. Навет няма за што купіць падручнікаў да вучэння. Зважаючы на гэта, прашу не адказаць у маёй просьбе і даць, па магчымасці, памогу"[390]. Тым часам, курсантка Люцыя Габран (23 лютага 1922 г.) пісала: "*Прашу, калі ласка, даць мне якое небудзь пасобіе, бо нахаджуся ў вельмі цяжкім палажэнні. Я сірата, жыву з старой мацер'ю і сястрой-падросткам, каторыя не атрымліваюць ніадкуль жаднай памогі, а скарэй чакаюць ад мяне, як ад старшай. Жывём, прадаючы апошнія вешчы, якіх ужо мала асталося пасля таго, як пабывалі в бежанцах 6 гадоў. Прыехаў у родны край, з паўгода таму назад, страшэнна цяжка жыць без працы, без заробкаў, а грошы шмат трэба на пражыццё, на абуве, якой з началам вясны не буду мець (нават няма за што кніг купіць да вучэння)*"[391]. Тым часам, курсант Алесь Махноўскі прасіў дапамогі на пражыванне і вопратку. У яго лісце да кіраўніцтва курсаў ад 23 лютага 1922 году чытаем: "*Слухача Аляксандра С. Махноўскага. Маю ахвоту вучыцца, але мушу старацца дастаткаў для жыцця. Ды як на бяду – ні здараецца службы. Жыву цяпер у вялікіх недастатках. Каб як-небудзь датрываць на іх і не ўцячы далёка на заработкі, дык мушу старацца якой-небудзь цяпер дапамогі. Із гэтай бядой удаюся да Вас: шчыра прашу пастарацца мне якой-небудзь падмогі на жыццё, на кнігі, на цітрадкі*"[392]. У сувязі з наплывам лістоў педрада курсаў ухваліла зварот у Беларускі школьны аддзел з просьбай дапамагчы вышэйзгаданым курсантам грашыма на жыццё, кнігі і абутак[393].

Нягледзячы на матэрыяльныя цяжкасці, курсы працягваліся. 15 ліпеня 1922 г. Рада БША вырашыла стварыць пры іх рамесніцкі клас. Меркавалася, што выпускнікі змогуць навучаць рамеснай справе па двух спецыяльнасцях[394]. Магчыма, што да адкрыцця класа спрычыніўся рапарт К. Езавітава (27 траўня 1922 г.), у якім ён пісаў: "*Пры аб'ездзе вёсак і школак, селяне-беларусы вельмі часта зварочваліся да мяне з просьбай аб адчыненні Беларускае Рамесленае Школы, бо сялянства не мае ні сапожнікаў, ні краўцоў, ні сталяроў, ні шортнікаў, ні кузняцоў, ні слесараў і адчувае ў гэтых спецыялістах вялікую патрэбу. Прашу даведацца: якім парадкам адчыняюцца гэткія школы і ці можам мы гэткую школу адчыніць*"[395]. Забягаючы наперад, варта дадаць,

[390] LVVA, 2125 f., 5 ap., 392 l., 83 lp.
[391] LVVA, 2125 f., 5 ap., 392 l., 95 lp.
[392] LVVA, 2125 f., 5 ap., 392 l., 88 lp.
[393] LVVA, 2125 f., 5 ap., 392 l., 30, 80 lpp.
[394] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 1–5 lpp.; LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 2 lp.
[395] LVVA, f. 2125, apr. 5, l. 42, 44 lp.

што Рада БША вырашыла таксама стварыць спартовую секцыю. 20 красавіка 1923 г. яна звярнулася ў Агульны школьны дэпартамент з просьбай пра арганізацыю пры курсах секцыі па фізічным выхаванні[396].

Улетку 1922 г. на курсах адбыўся першы выпуск, іх скончыла 25 слухачоў. 15 ліпеня 1922 г. Рада Беларускага школьнага аддзела вырашыла "*пастараццца знайсці месца для курсантаў, якія скончылі курсы ў гэтым годзе, бо з іх будуць шмат свядомых і вельмі здольных працаўнікоў*"[397]. Пасля здачы 15 жніўня канцавога іспыту выпускнікі атрымалі пасведчанні настаўнікаў 1-й і 2-й ступені пачатковых школ (асобы са сканчанай сярэдняй асветай), настаўнікаў 1-й ступені пачатковых школ (асобы з 6-класнай пачатковай асветай), настаўнікаў-практыкантаў (асобы з 4-класнай пачатковай асветай)[398]. Сярод выпускнікоў былі тыя, хто пазней плённа працаваў на ніве беларускай асветы ў Латвіі. У тым ліку і маладая настаўніца Люцыя Габран, якая ў звароце ў Беларускі школьны аддзел (2 кастрычніка 1922 г.) пісала: "*маючы час і ахвоту быць вучыцелькай Беларускай школы, да чаго лічу сябе адпаведнай, прашу прызначыць мне працу дзе-небудзь у беларускай школе. Да гэтага дадаю пасведчанне аб сканчэнні беларускіх аднагадовых вучыцельскіх курсаў у м. Дзвінску*"[399].

Супрацоўніцтва паміж кіраўніцтвам БША і кіраўніцтвам курсаў не было лёгкім. Першы вінаваціў кіраўніка курсаў у бесклапотнасці і недакладнасці падчас справаздачнасці. Тым часам, апошні лічыў, што Беларускі школьны аддзел не разумее патрэб курсантаў і лектараў. 8 студзеня 1923 г. С. Сахараў раіў кіраўніку курсаў трымацца распараджэння міністра асветы, каб настаўнікі ў пагоні за заробкамі не бралі празмерную колькасць заняткаў, бо гэта шкодзіла іх прадуктыўнасці як лектараў курсаў[400]. У адказ кіраўнік курсаў сцвярджаў, што калі Міністэрства асветы будзе вызначаць нормы гадзін працы, дык лектары будуць вымушаны пакінуць курсы, бо іх праца аплачваецца не памесячна, а ў залежнасці ад колькасці выпрацаваных гадзін. Паколькі курсы не з'яўляліся галоўным месцам працы лектараў яны былі вымушаны падпрацоўваць у Даўгаўпілскай беларускай гімназіі, разглядаючы працу на курсах як дадатковы заробак. Кіраўнік курсаў адзначаў, што не бачыць магчымасці замяніць лектараў з прычыны адсутнасці адпаведных спецыялістаў. На яго думку, адмова ад паслуг лектараў будзе азначаць спыненне дзейнасці курсаў[401].

---

[396] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 6–14 lpp.; LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., lp. 84.

[397] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 2 lp.

[398] LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 2 lp.; LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 1–5 lpp.; НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 107, л. 47.

[399] LVVA, 2125 f., 5 ap., 216 l., 2 lp.

[400] LVVA, 2125 f., 5 ap., 346 l., 5 lp.

[401] LVVA, 2125 f., 5 ap., 346 l., 11 lp.

Кіраўніцтва Беларускага аддзела выступала супраць таго, каб на дзяржаўныя грошы набывалася літаратура для курсантаў[402].

17 верасня 1923 г. цэнзавая камісія БША (кіраўнік М. Дзямідаў) крытычна ацаніла працу кіраўніка курсаў А. Якубецкага, вінавацячы яго ў тым, што не прадаставіў адпаведных дакументаў пра курсантаў, што выклікала блытаніну падчас арганізацыі іспыту і выдачы пасведчанняў аб сканчэнні[403]. У сувязі з гэтым камісія вырашыла выдаць курсантам часовае пасведчанне пра допуск да настаўніцкай працы, але пры ўмове, што на працягу года, працуючы ў якасці практыкантаў, яны вытрымаюць іспыт на настаўнікаў 1-й катэгорыі. Акрамя таго, камісія прапанавала, пачынаючы з наступнага навучальнага года, перанесці курсы ў Рыгу, што мела станоўча паўплываць на іх якасць[404].

Улетку 1923 г. узнікла яшчэ адна непрыемная сітуацыя. 16 былых курсантаў абвінавацілі кіраўніка Беларускага школьнага аддзела ў тым, што ён не жадаў накіраваць іх на працу ў беларускіх школах[405]. Абвінавачанні былі вынікам неабазнанасці курсантаў. Насамрэч Беларускі школьны аддзел рэкамендаваў павятовым школьным управам накіраваць выпускнікоў курсаў на працу ў беларускія пачатковыя школы, але апошнія замарудзілі зацвярджэнне. У выніку ў курсантаў склалася памылковае ўражанне, што адказнасць за іх непрызначэнне нясе Беларускі школьны аддзел[406].

Нездаровая атмасфера вакол курсаў з цягам часу не палепшылася. Гэтаму спрыяла кепскае матэрыяльнае становішча. У ліпені 1923 г., у сувязі са скарачэннем бюджэту курсаў, Беларускі школьны аддзел звярнуўся да іх кіраўніка

---

[402] LVVA, 2125 f., 5 ap., 346 l., 9 lp.

[403] LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 94–95 lpp.

[404] LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 100–101 lpp.

[405] У заяве чытаем: "*Настаў апошні момант прызначання вучыцялёў у беларускія пачатковыя школы, між тым да гэтага часу ніхто з нас ніякага паведамлення, ніякае рады ад Вас не атрымаў. У свой час, на акце, у прамове Вы абяцалі даць усім нам магчымасць працы ў беларускіх школах. Але цяпер Вы выдаеце новыя пасведчанні на права выкладання ў Беларускіх школах асобам, якія не толькі ніколі не былі на беларускіх курсах, але і не хацелі быць, бо замест гэтага былі на Расейскіх курсах. Такім чынам, замест таго, каб у першую чаргу даць магчымасць працы нам, якія ўжо год таму назад йшлі на беларускія гадовыя курсы з верай і ў свае сілы, і ў Вашу падтрымку, Вы цяпер павялічваеце лік кандататаў асобамі неадпаведнымі з нацыянальнага боку, кіруючыся толькі асабістымі сімпатыямі. Апрача таго, на пасяджэнні школьнай павятовай ўправы ў м. Дзвінску 30-га жніўня г./г. быў дэлегаваны Вамі г. Шчорс, які на гэтым пасяджэнні заявіў, што ў Беларускім Аддзеле няма кандыдатаў на вучыцельскія пасады. Выходзячы з усяго гэтага, мы бачым, што Вы свядома ня хочаце даць нам па нейкіх матывах магчымасці працаваць у беларускіх школах, а таму просім паведаміць нас да 20-га верасня г./г. праз Кіраўніка Беларускіх Аднагадовых Вучыцельскіх Курсаў – ці прадстаўлены мы кандыдатамі на пасады вучыцялёў і куды. У выпадку неатрымання адказу ад Вас, копія гэтай нашай заявы будзе перадана Міністру Прасветы Латвіі і змешчана ў прэсе*". LVVA, 2125 f., 5 ap., 346 l., 136 lp.

[406] LVVA, 2125 f., 5 ap., 346 l., 136 lp.

з просьбай абмежаваць дзейнасць неабходнымі лекцыямі па асобных прадметах, даючы курсантам больш часу на самастойную працу[407]. 17 верасня 1923 г. цэнзавая камісія БША зноў прапанавала перанесці курсы ў Рыгу[408]. На наступны дзень Рада аддзела даручыла кіраўніку курсаў канчаткова вызначыць іх далейшы лёс. Нягледзячы на нястачу сродкаў, 28 кастрычніка 1923 г. Рада Беларускага школьнага аддзела прыняла рашэнне захаваць курсы і выпрацаваць далейшую праграму працы, а таксама вызначыцца наконт іх месцазнаходжання – у Даўгаўпілсе ці ў Рызе[409].

У рэшце рэшт восенню 1923 г. курсы былі перанесены з Даўгаўпілса ў Рыгу, а іх часовым кіраўніком быў прызначаны М. Дзямідаў. Спачатку яны месціліся ў будынку па адрасе *Maskavas iela 142*, а потым былі пераведзеныя ў будынак на *Maskavas iela 173*. Курсанты пачалі заняткі ў сталіцы 1 снежня 1923 г. Падчас пераезду курсаў з Даўгаўпілса ў Рыгу высветлілася, што знікла частка бібліятэкі, інвентара і інвернтарная кніга. Кіраўнік БША звярнуўся ў гэтай справе да К. Езавітава, які, на яго думку, мусіў прыняць інвентар. Апошні лічыў, што знікненне вышэйзгаданых рэчаў з'яўляецца вынікам нядбальства кіраўніка курсаў А. Якубецкага[410].

З мэтай паляпшэння матэрыяльнага становішча курсаў 23 студзеня 1924 г. Беларускі школьны аддзел прызначыў 400 латаў на стыпендыі курсантам, якія паходзілі з найбяднейшых сем'ям і мелі добрыя вынікі ў навучанні. Педагагічная рада размеркавала гэтыя грошы сярод 13 навучэнцаў[411]. У першыя гады працы курсаў у Рызе побытавыя ўмовы былі не найлепшыя. 9 лютага 1924 г. М. Дзямідаў інфармаваў кіраўніцтва Беларускага школьнага аддзела, што курсы не могуць нармальна працаваць, бо не вырашанае пытанне з інтэрнатам для курсантаў і памяшканнем пад вучэбны клас[412]. У рэшце рэшт курсанты атрымалі месцы ў інтэрнаце. У лютым 1924 г. БША перадаў курсам 10 жалезных ложкаў, 12 венскіх крэслаў, 4 начныя столікі, кацёл, самавар і г.д.[413]

У сувязі з тым, што гадавыя курсы не былі ў стане ў поўнай меры забяспечыць патрэбы беларускіх школ, К. Езавітаў яшчэ ў 1923 г. лічыў, што належыць іх ператварыць у 2-гадовыя. Аднак адпаведнае рашэнне не было прынята[414].

За прыймо кандыдатаў адказвала педагагічная рада, старшынём якой яшчэ 1 снежня 1923 г. быў абраны М. Дзямідаў, а сакратаром А. Родзька. Выпускнікі

---

[407] LVVA, 2125 f., 5 ap., 346 l., 89 lp.
[408] LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 94–95 lpp.
[409] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 15, 18 lpp.
[410] LVVA, 2125 f., 5 ap., 346 l., 76 lp.
[411] LVVA, 6845 f., 2 ap., 1 l., 3 lp.
[412] LVVA, 2125 f., 5 ap., 348 l., 93 lp.
[413] LVVA, 6845 f., 2 ap., 13 l., 65 lp.
[414] LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 94–95 lpp.

атрымлівалі права працаваць у 6-гадовых асноўных школах. Курсанты здавалі іспыты па гісторыі беларускай літаратуры, праграма якіх ахоплівала творчасць Цёткі, Алеся Гаруна, Францішка Багушэвіча, Максіма Багдановіча, Якуба Коласа, Янкі Купалы, веды пра дзейнасць нашаніўцаў і г.д.[415]

Крыніцы дазваляюць вызначыць асабовы, колькасны, нацыянальны і канфесійны склад курсантаў і лектараў. Сярод слухачоў курсаў у 1922/23 гг. было 10 беларусаў і 3 немцы. Паводле веравызнання яны былі: праваслаўнымі – 4, стараверамі – 3, каталікамі – 3, лютэранамі – 3. На думку кіраўнікоў курсаў палова з іх у рознай ступені праяўляла арганізацыйныя здольнасці, а 5 маглі займаць кіроўныя пасады[416]. У 1923/24 гг. на курсах навучалася 19 курсантаў. Іх канфесійная прыналежнасць была наступная: 12 праваслаўных, 6 каталікоў і 1 лютэранін. Паводле нацыянальнага складу двое былі латышамі, астатнія дэкларавалі сябе беларусамі[417]. Сярод курсантаў была Таіса Розім, якая была латышкай па бацьку і рускай па маці, але расла ў Ковенскай губерні сярод беларусаў. Жанчына не ведала латышскай мовы, а на курсы паступіла з мэтай вывучэння беларускай і латышскай моваў, каб потым атрымаць працу ў беларускіх школах[418]. У 1924/25 гг. на курсах знаходзілася 20 курсантаў, сярод якіх 9 былі праваслаўнымі, 10 каталікамі і 1 старавераm[419].

5 сакавіка 1924 г. пасаду кіраўніка курсаў заняў А. Родзька[420]. У гэты час іх лектарскі склад выглядаў наступным чынам: Р. Плыгаўка, С. Сахараў, М. Дзямідаў, С. Сіцько, Павел Сталяроў, Петэрс Петэрсанс, Аляксей Вінаградаў, Пётр Бажко і Вільгельміна Марцінэле[421]. У першыя гады працы курсаў у Рызе іх скончыў шэраг асоб, якія ўключыліся ў беларускае асветнае жыццё. Сярод іх можна прыгадаць Галіну Нікіфароўскую, Мікалая Краўчанку (верасень 1924 г.) і Пятра Масальскага (лета 1925 г.). Архіўныя крыніцы дазваляюць вызначыць колькасны склад лектараў і слухачоў курсаў.

Табліца 21. Колькасны склад Дзяржаўных беларускіх настаўніцкіх курсаў у 1921–1926 г.

1921/22 г.		1922/23 г.		1923/24		1924/25 г.		1925/26 г.	
Лектары	**Слухачы**	**Лектары**	**Слухачы**	**Лектары**	**Слухачы**	**Лектары**	**Слухачы**	**Лектары**	**Слухачы**
7	30	8	26	10	19	8	20	12	26

Крыніца: LVVA, 2125 f., 5 ap., 259 l.

[415] LVVA, 6845 f., 2 ap., 3 l., 45 lp.
[416] LVVA, f. 2125, apr. 5, l. 256, 41 lp.
[417] LVVA, 2125 f., 5 ap., 348 l., 45–49 lpp.
[418] LVVA, 2125 f., 5 ap., 348 l., 214 lp.
[419] LVVA, f. 6845, apr. 2, l. 18, 1–18 lpp.
[420] LVVA, 2125 f., 5 ap., 348 l., 94 lp.
[421] LVVA, 2125 f., 5 ap., 351 l., 13–14 lpp.

Незалежна ад гадавых курсаў, існавалі кароткатэрміновыя летнія курсы падвышэння кваліфікацыі педагагічных кадраў для беларускіх пачатковых школ. У першую чаргу гаворка ідзе пра курсы дзяржаўнай мовы і беларусазнаўства. У апошнім выпадку адрасатамі навучання былі былыя "царскія" настаўнікі, якія не ведалі беларускай мовай. У траўні 1922 г. Беларускі школьны аддзел разаслаў цыркуляр кіраўнікам беларускіх школ з патрабаваннем накіраваць прынамсі аднаго настаўніка на курсы беларусазнаўства[422]. Згодна з распараджэннем Беларускага школьнага аддзела ад 22 красавіка 1923 г., усе настаўнікі беларускіх школ мусілі праслухаць курсы беларусазнаўства. Ад гэтага абавязку былі вызвалены толькі настаўнікі-латышы, якія маглі іх наведваць добраахвотна. 18 траўня 1923 г. кіраўніцтва БША скіравала наступнае паведамленне да дырэктарам беларускіх школ: "*На моцы пастановы Рады Беларускага Аддзелу ад 22 красавіка гг. курсы па латышскай мове і па беларусазнаўстве з'яўляюцца абавязковымі для ўсіх вучыцялёў вучыцелек беларускіх школ за выняткам ледзь асоб, спецыяльна выкладаючых урадовую мову і належачых да латышскае нацыянальнасці, якія могуць з'явіцца на курсы па самахоцькаму жаданню. Пры курсах будзе наладжан інтэрнат, прычым кожны курсант павінен узяць з сабою пасцельную бялізну, адзяяла і падушку. Кіраўніком курсаў Радай Беларускага Управління прызначан настаўнік Дзвінскае Урадавае Беларускае гімназіі Уладзімір Васіллевіч Пігулеўскі, да якога і належыць курсантам звяртацца за ўсімі спраўкамі (Дзвінск, Варшаўская вул. № 16)*"[423].

У выніку ўлетку 1923 г. у Даўгаўпілсе былі зладжаныя 2-месячныя беларускія летнія настаўніцкія курсы (*Baltkrievu skolotāju vasaras kursi*)[424]. Яны пачалі працу 26 чэрвеня на базе беларускай гімназіі. Курсанты праслухалі лекцыі па латышскай мове, беларусазнаўстве, фізічным выхаванні. Адначасова з гэтымі курсамі пачаліся 2-месячныя курсы для практыкантаў па педагогіцы, дыдактыцы і методыцы (кіраўнік У. Пігулеўскі). Удзельнікі павінны былі ўзяць пасцельную бялізну, коўдру і падушку[425]. Курсы працавалі ў перыяд з 25 ліпеня па 26 жніўня 1922 г. у Даўгаўпілсе, а праслухала іх 16 чал.[426] У наступныя гады ў Даўгаўпілсе ладзіліся 1,5-месячныя беларусазнаўчыя

---

[422] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 47, л. 11.

[423] LVVA, 6845 f., 2 ap., 4 l., 49 lp.

[424] Э. Екабсонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [в:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 59.

[425] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 48, л. 16, 17; LVVA, 2125 f., 5 apr., 38 l., 660 lp.

[426] Гэта былі: Алена Сушынская, Віктар Дзяргач, Фелікс Каляда, Уладзімір Высоцкіх, Марыя Чыжэвіч, Філіцыян Астроўскі, Эдвард Вайводзіш, Алекс Глекнэ, Сцяпан Махноўскі, Юры Ленаў, Віктар Катышаў, Лявон Мадзялеўскі, Мары Ленава, Кірыла Емельянаў, Алена Пашкевіч, Альбіна Ласіс. LVVA, 2125 f., 5 apr., 38 l., 447 lp.

курсы, а Беларускі школьны аддзел рэгулярна дасылаў кіраўнікам асноўных школ інфармацыю пра неабходнасць удзелу ў іх. Кароткачасовыя курсы адбываліся таксама ў Лудзы. Пад кіраўніцтвам інспектара асноўных школ Лудзенскага павета ў перыяд ад 25 чэрвеня па 1 жніўня 1924 г. у будынку мясцовай беларускай гімназіі былі зладжаны настаўніцкія курсы латышскай мовы і беларусазнаўства[427].

Для настаўнікаў, якія не мелі скончанай сярэдняй адукацыі, ладзіліся агульнаасветныя курсы. З верасня 1924 г. кіраўніцтва БША інфармавала настаўнікаў пра магчымасць бясплатнага наведвання такіх курсаў пры Даўгаўпілскай беларускай гімназіі[428].

Пачатковыя школы

Аснову беларускай адукацыі складалі пачатковыя (асноўныя) школы, у якіх было найбольш вучняў. У сувязі з гэтым, варта ўважлівей разгледзець фінансавую і матэрыяльную сітуацыю гэтых школ і якасць навучальнага працэсу, ахарактарызаваць настаўнікаў і навучэнцаў, вызначыць месца школьнай працы ў культурным жыцці беларусаў.

Фінансаванне. Беларускія школы фінансаваліся з дзяржаўных сродкаў па лініі Беларускага школьнага аддзела. Бюджэт падаваўся на разгляд ураду міністрам асветы кожны навучальны год. Потым ён зацвярджаўся латвійскім парламентам. Памер бюджэту залежаў ад колькасці прадстаўнікоў беларускай нацыянальнасці ў краіне. З прызначаных сродкаў частка ішла на ўтрыманне БША і беларускіх настаўніцкіх курсаў, а частка – на дапамогу школам. Падзел паміж пачатковымі школамі ажыццяўляўся Радай БША. Восенню 1921 г. апошні пачаў працу пры абмежаваным бюджэце, паколькі на момант яго стварэння было невядома колькі школ будзе ў яго падпарадкаванні. 14 лістапада 1921 г. кіраўнік БША ў звароце да Міністэрства асветы адзначаў, што прадугледжаны ўрадам каштарыс на перыяд з 1 кастрычніка 1921 да 1 красавіка 1922 гг. не задавальняе патрэб беларускай меншасці. Ён лічыў, што сума грошай мусіць быць адэкватнай колькасці беларусаў у Латвіі. З разлікаў кіраўніка БША вынікала, што беларуская меншасць, якая, паводле перапісу насельніцтва 1920 г., складала 5,3% жыхароў Латвіі, павінна была атрымаць значна большую суму за прызначаныя ўрадам 167 173 рублёў. Кіраўнік Беларускага школьнага аддзела звяртаў увагу на патрэбу дафінансавання працы беларускага школьнага інспектара і справавода і прасіў да

[427] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 46, л. 12.

[428] LVVA, 6845 f., 2 ap., 4 l., 122 lp.

1 красавіка 1922 г. выдаткаваць яшчэ 539 357 руб.[429] Адначасова ён абгрунтоўваў патрэбу павелічэння бюджэту ў 1921/22 гг. тым, што беларусы ў Латвіі не мелі раней школ і займелі іх пазней за іншыя нацыянальнасці, таму патрабавалася больш грошай, каб навярстаць страчанае[430].

Зацверджаны Соймам 28 ліпеня 1923 г. бюджэт БША прадугледжваў 94 732 латаў, з якіх было прызначана: на ўтрыманне адміністрацыі аддзела – 9 192, на розныя выдаткі – 1 583, на ўтрыманне школ – 93 957[431]. У 1923/24 гг. бюджэт Беларускага школьнага аддзела склаў 2 760 180 рублёў. Кіраўніцтва БША лічыла, што неабходна было выдаткаваць 3 086 007 рублёў (у аднаведнасці з колькасцю беларусаў у Латвіі). Беларускі бок лічыў, што дзяржаўныя органы не ўзялі пад увагу такіх патрэб беларускай меншасці, як: тэатр, агульнаадукацыйныя курсы, прафесійная падрыхтоўка і г.д.[432]

Па меры адкрыцця новых школ бюджэт беларускай школьнай справы павялічыўся. З дзяржаўнага бюджэту на яго патрэбы было асігнавана ў 1921/22 гг. – 10 816 латаў, 1922/23 гг. – 46 151, у 1923/24 гг. – 94 732, у 1924/25 гг. – 95 840[433]. Нягледзячы на гэта, беларускім школам не хапала грошай, бо асноўная маса вучняў паходзіла з незаможных сем'яў, якім патрабавалася дадатковая дапамога. Напрыклад, бацькі не былі ў стане забяспечыць дзяцей падручнікамі і сшыткамі. Паколькі дзяржаўных грошай не хапала, беларускі актыў мусіў самастойна шукаць дадатковыя крыніцы ўтрымання школ. 15 ліпеня 1922 г. Рада БША ўхваліла рэзалюцыю пра стварэнне пры аддзеле фінансавага фонду на патрэбы беларускай асветы ў Латвіі. Сродкі фонду павінны былі паходзіць ад ахвярадаўцаў[434]. 28–30 снежня 1922 г. у Даўгаўпілсе была скліканая першая беларуская настаўніцкая нарада ў Латвіі, удзельнікі якой узнялі пытанне пра стварэнне беларускага настаўніцкага фонду з мэтай арганізацыі лекцый, выдавецкай дзейнасці, дапамогі незаможным настаўнікам і вучням, збірання этнаграфічнага і гістарычнага матэрыялу, закупу літаратуры і падручнікаў. Статут фонду меліся абмеркаваць удзельнікі другой канферэнцыі. Але, не чакаючы гэтага, даўгаўпілскае настаўніцтва выйшла з ініцыятывай: пачынаючы з 1 студзеня 1923 г. штомесяц ахвяраваць па 1–2% заробку на карысць фонду[435]. Кіраўніцтва Беларускага школьнага аддзела выдала цыркуляр да настаўнікаў і вучняў з просьбай падтрымаць ініцыятыву і абмеркаваць яе на школьных радах. Кіраўніцтва БША бачыла ў гэтым пачатак стварэння

---

[429] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 107, л. 29–30, 37–38.

[430] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 109, л. 7, 8.

[431] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 11 lp.

[432] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 43, л. 8–9.

[433] LVVA, 2125 f., 5 apr., 106 l., 2 lp.

[434] LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 3 lp.

[435] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 48, л. 5.

Уселатвійскага беларускага настаўніцкага хаўрусу[436]. 23 кастрычніка 1923 г. С. Сахараў звярнуўся да кіраўнікоў беларускіх школ з заклікам пачаць адлічаць з заробку складкі на стварэнне культурнага фонду пры Беларускім школьным аддзеле. За сабраныя грошы планавалі стварыць беларускі музей і дапамагаць бедным вучням[437].

Пры БША была створаная часовая камісія настаўніцкага фонду ў наступным складзе: на Лудзеншчыне – сябра Рады БША і кіраўнік лудзенскай школы Р. Плыгаўка, сябра павятовай школьнай управы Пётр Клявінь, сябра гарадской школьнай управы Мікола Іваноў; і на Даўгаўпілшчыне – сябра Рады БША Феліцыян Астроўскі, сябра павятовай школьнай управы Віктар Дзяргач, кіраўнік Даўгаўпілскай школы Андрэй Якубецкі[438]. Лудзенскія настаўнікі павінны былі дасылаць свае ахвяраванні Р. Плыгаўку, а даўгаўпілскія – А. Якубецкаму[439]. У верасні-кастрычніку 1923 г. Р. Плыгаўка сабраў сярод лудзенскага настаўніцтва (10 чал.) 1 тыс. рублёў, якія перадаў М. Дзямідаву, дэлегаванаму БША ў Даўгаўпілс і Лудзу з мэтай удзелу ў павятовых настаўніцкіх канферэнцыях[440].

У пошуку грошай на ўтрыманне школ БША дапамагала таварыства "Бацькаўшчына". Кіраўніцтва таварыства інфармавала аддзел пра становішча і патрэбы беларускага насельніцтва ў Латгаліі. Кастусь Езавітаў адзначаў, што існаваў пэўны падзел працы паміж БША і таварыствам: першы апекаваўся ўжо дзейнымі школамі, а другое – рыхтавала сярод насельніцтва глебу для адкрыцця новых[441]. Намаганнямі таварыства ў 1923 г. у мясцовасці Вышкі была зладжаная беларуская летняя дзіцячая калонія для 23 дзетак з незаможных сем'яў[442]. Нягледзячы на дзяржаўнае фінансаванне і самастойныя захады, беларускае настаўніцтва змагалася з хранічнай нястачай грошай на арганізацыйную і навучальную працу.

Матэрыяльнае становішча. Беларускія пачатковыя школы (за выключэннем прыватных) былі на дзяржаўным утрыманні. Заробкі настаўнікам ішлі з дзяржаўнага бюджэту, а іншыя выдаткі (апал і рамонт будынка, электрычнасць) брала на сябе мясцовае самакіраванне. Беларускі школьны аддзел звяртаўся ў павятовыя і валасныя ўправы з просьбай забяспечыць школы апалам, газай, адрамантаваць будынак і г.д.[443] Пэўную падтрымку аказвалі

[436] LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 50 lp.
[437] LVVA, 2125 f., 5 ap., 18 l., 46 lp.
[438] LVVA, 6845 f., 2 ap., 4 l., 39 lp.
[439] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 48, л. 10; LVVA, 2125 f., 5 apr., 374 l., 19 lp.
[440] LVVA, 2125 f., 5 ap., 20 l., 2 lp.
[441] К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, Рыга 1927 [перадрук: Нью-Ёрк – Менск 2013], с. 90.
[442] *З Латвіі,* "Крывіч" 1923, № 3, с. 62.
[443] LVVA, 2125 f., 5 ap., 232 l., 20 lp.

беларускія культура-асветныя таварыствы, у першую чаргу Таварыства беларускіх настаўнікаў у Латвіі[444].

Матэрыяльнае становішча школ было розным. Прыкладам была беларуская школа ў **Даўгаўпілсе**. Спачатку ў ёй не хапала мэблі (парт і сталоў), таму вучні былі вымушаны сядзець на падлозе. Дапамагла мясцовая беларуская гімназія, якая 13–14 верасня 1922 г. адпусціла школе чатыры класы і настаўніцкі пакой, а бацькі зрабілі з дошак часовыя парты[445]. Кіраўнік школы так апісваў матэрыяльны стан класных памяшканняў: "*цяпер ёсць у класах парты, але яны збітыя паспехам з дасок і з боку школьнага ніжэй усякай крытыкі – не па ўзросту вучняў і апошнія з боку фізічнага калечацца*"[446]. У сакавіку 1923 г. кіраўнік школы А. Якубецкі "засыпаў" БША роспачнымі лістамі з просьбамі пра дапамогу, без якой далейшая праца школы будзе немагчымая. У прыватнасці, ён сцвярджаў, што ў школе адсутнічаюць прылады неабходныя на занятках матэматыкі, геаграфіі, біялогіі (глобус, метрычныя меры і г.д.)[447].

Першапачаткова ўстанова месцілася ў будынку інтэрната беларускіх гадавых настаўніцкіх курсаў, які не быў прыстасаваны да навучання. З цягам часу школе былі вылучаны тры пакоі ў будынку беларускай гімназіі, куды ў сярэдзіне верасня 1922 г. пераехала школа з 170 вучнямі[448]. У 1924 г. школа пераехала ў будынак на вуліцы Стараверскай 53, які быў больш адпаведны для навучання[449]. Нягледзячы на цяжкасці, Даўгаўпілская школа знаходзілася ў лепшым матэрыяльным становішчы за іншыя беларускія пачатковыя школы. Школа мела ўласную сталярную майстэрню. Дзякуючы падтрымцы гарадскога самакіравання, былі закупленыя пяць камплектаў сталярных інструментаў, а за адзін заплаціла школьная рада. Бацькі-сталяры абсталявалі працоўныя месцы, а настаўнік Канстанцін Александровіч пагадзіўся бясплатна навучаць дзяцей сталярнай справе. Гэта была адзіная пачатковая школа ў горадзе з сталярнай майстэрняй, і кіраўнік школы лічыў, што гэта дапаможа больш паспяхова спаборнічаць за вучняў з рускімі і польскімі школамі[450].

---

[444] С. Казека, *Люцынская беларуская асноўная 6-ціклясовая школа за 10 год працы – з 1922 па 1932 год*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 3(13), с. 183–185.

[445] LVVA, 2125 f., 5 ap., 176 l., 33 lp.

[446] LVVA, 2125 f., 5 ap., 35 l., 15 lp.

[447] LVVA, 2125 f., 5 ap., 176 l., 103–106 lpp.

[448] А. Якубецкі, *Гісторыя разьвіцьця Дзьвінскай Беларускай Асноўнай Школы*, "Голас беларуса" 1926, № 19 ад 1 верасня, с. 4.

[449] K. Kunicka, *A Pole Who Contributed to Belarusian Education and Cultural Life in Latvia: The Peculiar Case of Konstanty Aleksandrowicz* [in:] *In the Schadow of Others. Belarusia-Latvian Relations from the Past to Nowadays*, ed. Mirosław Jankowiak, Kiryl Kascian, Praha 2022, s. 380.

[450] LVVA, 2125 f., 5 ap., 401 l., 130 lp.

У першыя гады існавання з матэрыяльнымі цяжкасцямі змагалася **Лудзенская** школа. Праз адсутнасць уласнага памяшкання, яна месцілася ў будынку латышскай школы, дзе заняткі для вучняў-беларусаў ішлі ў другую змену[451]. Беларускі школьны аддзел і таварыства "Бацькаўшчына" шукалі асобны будынак, у які магла б пераехаць школа. Разглядалі магчымасць арандаваць дом нейкай Нікіфароўскай на рагу вуліц Себежскай і Мікалаеўскай. Аднак у рэшце рэшт быў знойдзены іншы будынак. 19 лютага 1922 г. беларуская школа пераехала ў дом на вуліцы Талавійскай 21. Першапачаткова ўтрыманне будынка і гаспадарчыя выдаткі былі ўскладзеныя на школьную раду, якая атрымоўвала нязначную дапамогу з таварыства "Бацькаўшчына". Адначасова БША выказаў гатоўнасць часткова кампенсаваць гаспадарчыя выдаткі школы[452]. У лютым 1923 г. інспектар К. Езавітаў наведаў лудзенскую школу з праверкай. У гэты час у пяці класах (пачатковым і 1–4) налічвалася 172 вучні. У школе працавалі сем настаўнікаў, у тым ліку Р. Плыгаўка (кіраўнік), С. Казека, М. Іваноў, С. Васілеўская, Раіса Жданко і тры катэхеты: праваслаўны, каталіцкі, стараверскі. На такую колькасць вучняў школа мела толькі два класныя пакоі, таму заняткі ішлі ў дзве змены. На думку К. Езавітава найгоршым было тое, што ўласнага пакою не меў пачатковы клас, у выніку наймалодшыя вучні вярталіся дахаты "цёмнымі зімовымі вечарамі". Акрамя таго, беларускі школьны інспектар адзначыў, што 1-шы клас налічваў ажно 66 вучняў, што адбівалася на якасці навучання. Ён лічыў неабходным падзяліць клас на два[453].

У горшым становішчы знаходзіліся вясковыя школы. У справаздачы пра дзейнасць Беларускага школьнага аддзела ў першы год існавання беларускіх школ у Латвіі адзначалася, што ў школах, размешчаных у раёнах былых баявых дзеянняў, не хапала будынкаў і мэблі, таму заняткі нярэдка адбываліся ў сялянскіх хатах[454]. Адной з галоўных праблем была непрыстасаванасць школьных памяшканняў да навучальнай працы, перадусім нястача мэблі. Нярэдка парты і дошкі рабілі настаўнікі, вучні ці бацькі вучняў. Ананімны актывіст з Лудзы пісаў у БША ў 1923 г.: "*У нашым павеце існуе 31 беларуская школа. З пачатку вучэбнага года гэтыя школы ўзяліся працаваць поўным ходам, хоць у некаторых варунках школьнае працы былі цяжкія дзеля цеснаты памешканняў, недахвату класовай мэблі (напр. Шушкаўская шк.) і вучэбных дапамог*"[455].

Гэтыя назіранні пацвярджаюць вынікі інспекцый, праведзеных беларускім школьным інспектарам і справаводам БША. З рапартаў апошняга вынікала,

---

451 НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 43, л. 3.

452 НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 43, л. 3; НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 45, л. 14.

453 LVVA, 2125 f., 5 ap., 155 l., 36–38 lpp.

454 НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 110, л. 3–5.

455 LVVA, 2125 f., 5 ap., 105 l., 72 lp.

што **Зілупская** 6-класная беларуская школа ў 1921/22 гг. пачала навучальны год толькі 17 кастрычніка з прычыны нясканчанага рамонту школьнага будынка[456]. У лістападзе 1922 г. кіраўнік **Шкелаўскай** школы, якую наведвала 79 вучняў, інфармаваў школьнага інспектара, што праз адсутнасць парт дзеці там вучыліся стоячы альбо седзячы на падлозе на разасланых кажухах[457]. Пасля інспекцыі школы К. Езавітаў высветліў, што яна складалася з аднаго пакоя, у выніку чаго вучням падчас заняткаў не хапала паветра, "*таму прыходзіцца ў часе лекцыяў адчыняць дзверы, каб найшло чыстага паветра*"[458]. У **Шушкаўскай** школе праз нястачу мэблі вучні сядзелі па 7–8 чалавек за адной партай[459]. У падобнай сітуацыі апынулася **Цуцуркаўская** школа, якая мела адно памяшканне на пяць класаў, што стварала праблемы ў працы настаўнікаў[460]. Не лепш было ў **Нова-Слабадской** школе, якая патрабавала грунтоўнага рамонту[461]. 27 сакавіка 1923 г. яе наведаў К. Езавітаў, які пісаў: "*памяшканне школы знаходзіцца ў земскім будынку, спецыяльна будаваным для школы, але разбураным вайной; класны пакой толькі адзін і так дужа маленькі; ёсць пакой для вучыцелькі і для стоража; калі б зрабіць рамонт прыстройкі, што ёсць у школе, дык было б яшчэ класнае памешканне і пакой для 2-й вучыцелькі*"[462].

Залеская школа знаходзілася ў будынку былога фальварка мясцовага землеўласніка. З прычыны рамонту, заняткі з удзелам трох настаўнікаў пачаліся ў адным невялікім памяшканні[463]. Нягледзячы на наяўнасць парку, саду і зямельнага надзелу (6 га), сам будынак быў у кепскім стане, паколькі пацярпеў падчас вайны. Тры пакоі займалі класы, а ў чатырох знаходзіліся кватэры настаўнікаў[464]. Справавод Беларускага школьнага аддзела Я. Шчорс, наведаўшы школу, адзначаў: "*У быўшым маёнтку Залессе, у 6-ці верстах ад ст. Зілупэ. Займае мураваны дом б. памешчыка пры вялікай дарозе на ўзгорку, школа сваім надворным відам робіць вельмі прыемнае ўражанне, якое павялічваецца харошым пад'ездам з палянкамі драўлянае расціны перад ім і вялікім паркам за будынкам. К будынку і парку падыходзіць на сяліцьбе харошы фруктовы сад. На жаль, прыгожаму пляну сяліцьбы і надворнаму абліччу не адпавядае яго нутранае становішча. Былая пышнасць убранства панскіх пакояў за час вайны зруйнавана, моцна і забруджана. У доме не хапае*

[456] LVVA, 2125 f., 5 apr., 34 l., 196 lp.
[457] LVVA, 2125 f., 5 ap., 213 l., 3 lp.
[458] LVVA, 2125 f., 5 ap., 212 l., 8 lp.
[459] LVVA, 2125 f., 5 apr., 212 l., 14 lp.
[460] LVVA, 2125 f., 5 ap., 121 l., 11–12 lpp.
[461] LVVA, 2125 f., 5 ap., 34 l., 2 lp.
[462] LVVA, f. 2125, apr. 5, l. 134, 2 lp.
[463] LVVA, 2125 f., 5 ap., 230 l., 32 lp.
[464] LVVA, 2125 f., 5 apr., 34 l., 210 lp.

многа дзвярэй ваконных рам, хатніх прылад. У цяперашні час для патрэб школы абы-як прыладжана пад класы 4 пакоі пад кватэры вучыцялёў. Адзін прастор адведзены пад залу з убогаю прыладаю для невялічкае сцэны з скамейкамі для гледачоў. Для прыдання школе належнага віду неабходны каштоўны рамонт і ў інтарэсах гаспадарчасці і эканоміі трэба зрабіць гэта адразу, не раскладаючы яго на некалькі гадоў. Падвальнае пад домам памяшчэнне неабходна ачысціць ад пастаронніх жыльцоў і выкарыстаць яго для рожных патрэб"[465]. 28 чэрвеня 1923 г. кіраўнік школы Аляксандр Еўдакімаў скардзіўся на кепскае стаўленне да школы з боку мясцовай валасной управы, якая даволі безадказна ставілася да сваіх абавязкаў і не дапамагала школе апалам і рамонтам, што ўскладняла навучальны працэс. У пошуках грашовых сродкаў школа планавала зладзіць вечарыну, прыбытак з якой хацела прызначыць на гаспадарчыя мэты[466].

Не лепшыя ўмовы панавалі ў **Ляўдарскай** школе, дзе адсутнічала школьная мэбля, у выніку чаго вучні карысталіся неадпаведна нізкімі сталамі. Дзеці былі пазбаўлены магчымасці правільна сядзець, калечылі сваю фігуру[467]. Кіраўнік **Дудэльскай** школы Сцяпан Махноўскі 20 чэрвеня 1923 г. пісаў, што заняткі адбываюцца ў неадпаведных памяшканнях, маленькіх і з нізкай столлю, а школьны будынак патрабуе рамонту, на які ніхто не хоча даваць грошай[468]. У **Краслаўскай** школе адчувалася вострая нястача мэблі, не хапала партаў, таму некаторыя вучні мусілі стаяць у часе ўрокаў[469].

Бадай, найгоршыя ўмовы панавалі ў **Чыўчынскай** і **Ляўзінскай** школах, якія месціліся ў сялянскіх хатах. Пра апошнюю Я. Шчорс пісаў: "*Школа змяшчаецца ў цеснай і бруднаватай сельскай хаце, у каторай адначасна працуюць вучыцелька і вучыцель перашкаджаючы, канешне, адзін другому. Парты не толькі старой формы, але і з паламанымі верхнімі сталамі; у час пісьма пры цеснаце і паламаных сталох у парт вучні не маюць апоры для рук, павінны згібацца і наогул пазбаўлены магчымасці сядзець належным чынам, а павінны калечыць сябе. Частка дзяцей павінна сядзець за дошкамі, паложанымі на казлы, абы-як, груба скалочаныя. Пры такім становішчы не толькі не можа быць гаворкі аб гігіене, але нават аб простай выгодзе. Агулам памяшканне і яго абстава твораць вельмі прыкрае ўражанне*"[470]. У падобных умовах працавала **Шылаўская** школа, якая месцілася ў двух сялянскіх будынках. Вось як характарызаваў становішча справавод БША: "*Обе комнаты малы, тесны,*

[465] LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 61 lp.
[466] LVVA, 2125 f., 5 apr., 34 l., 196 lp.
[467] LVVA, 2125 f., 5 apr., 34 l., 211 lp.
[468] LVVA, 2125 f., 5 ap., 35 l., 88 lp.
[469] LVVA, 2125 f., 5 ap., 146 l., 27 lp.
[470] LVVA, 2125 f., 5 apr., 34 l., 211 lp.

имеют низкие потолки и маленькие окна. Значительную часть пространства комнат занимают большие русские печи, причем в одной из комнат за печкой находится комода хозяина дома, на которой он, по словам учительницы, спит иногда во время уроков. Парты и учащиеся занимают все пространство комнат, оставляя лишь узкий проход между ними. Теснота помещений делает их душными. В меньшем из них во время занятий должна быть открыта дверь в сени. Вообще помещение школы производить удручающее впечатление и вызывает участие к бедным детям и страдалицам учительницам, вынужденным целые дни проводить в этой атмосфере (...) Сверх всякого ожидания дети выглядат здоровыми и веселыми"[471]. Матэрыяльнае становішча **Эверсмуйжскай** школы было надзвычай складаным, пра што сведчыць ліст кіраўніка Уладзіміра Ціхамірава ў Беларускі школьны аддзел ад 20 лютага 1924 г. Аўтар падкрэсліваў, што бацькі не ў стане ўтрымліваць школу. Таму прасіў парупіцца пра перавод школы на ўтрыманне самакіравання[472].

Крыху лепшыя матэрыяльныя ўмовы былі ў **Бяляеўскай** і **Пасіенскай** школах, становішча якіх супрацоўнікі БША ацанілі як здавальняючае. Апошняя размяшчалася ў новым будынку, у класных памяшканнях было "даволі свежага паветра і многа святла"[473]. Ёсць падставы меркаваць, што лепшым было і становішча **Брадайжскай** школы. У 1922 г. яе кіраўнік інфармаваў Беларускі школьны аддзел, што школа пільна патрабуе падручнікаў і чароўнага ліхтара, каб ладзіць чытанкі для вучняў і мясцовага насельніцтва. Разам з тым, ён нічога не пісаў пра стан будынка, толькі адзначаў, што ў будучыні школе будзе трэба шафа на кнігі, два сталы, 6 крэслаў на інтэрнат для незаможных вучняў[474].

З тае прычыны, што некаторыя школы месціліся ў прыватных будынках, яны не былі застрахаваныя ад самаволі гаспадароў. Апошнія маглі спыніць арэнду, не чакаючы заканчэння кантракту. Так адбылося ў Бяляеўскай школе, якая, не скончыўшы 1921/22 гг., мусіла шукаць сабе новае месца[475].

Матэрыяльныя цяжкасці школ выклікалі непакой беларускіх асветных устаноў, якія намагаліся забяспечыць іх адпаведнымі сродкамі, інвентаром і будынкамі. Гэта не заўсёды было проста. Кіраўніцтва БША лічыла, што можна дапамагчы школам выбрацца з безграшоўя, надзяліўшы іх зямлёй. Справавод Я. Шчорс лічыў неабходным выкарыстаць дзяржаўную зямлю на патрэбы школ. На яго думку, надзелы з дзяржаўнага зямельнага фонду

---

471 LVVA, 2125 f., 5 apr., 34 l., 213 lp.
472 LVVA, 2125 f., 5 apr., 53 l., 33 lp.
473 LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 61 lp.
474 LVVA, 2125 f., 5 apr., 34 l., 98 lp.
475 LVVA, f. 2125, apr. 5, l. 109, 17 lp.

можна прызначыць на ўчасткі пад новыя школьныя будынкі. Ён патрабаваў ад мясцовых улад большай увагі да школьнай справы і матэрыяльнага забеспячэння школ[476]. У студзені 1924 г. Беларускі школьны аддзел звярнуўся да зямельных інспектараў з просьбай вылучыць некаторым школам зямельныя надзелы[477].

На пачатку 1920-х гг. беларускія школы шукалі магчымасці атрымаць матэрыяльную дапамогу па лініі Амерыканскага чырвонага крыжа. У 1922 г. Дзіцячы фонд пры Латвійскім чырвоным крыжы атрымаў ад Амерыканскага чырвонага крыжа 4 млн руб. на асветныя патрэбы нацыянальных меншасцей. З гэтай сумы беларусы атрымалі 150 тыс. руб. (4,19%). У сувязі з гэтым Камітэт дапамогі пры Нацыянальна-дэмакратычным саюзе рускіх грамадзян у Латвіі звярнуўся ў БША з прапановай зладзіць супольную дзіцячую калонію[478].

10 студзеня 1922 г. Беларускі школьны аддзел звярнуўся ў Раду Кангрэсу знішчаных вайной мясцовасцей у Латвіі з просьбай вылучыць на патрэбы беларускіх школ 1 млн руб., каб апрануць беларускіх дзяцей і тым самым палепшыць наведвальнасць школ. У звароце падкрэсліваўся гаротны гаспадарчы стан латгальскіх беларусаў, землі якіх пацярпелі ў выніку вайны і рэвалюцыі. Адначасова БША раіў таварыству "Бацькаўшчына" дэлегаваць прадстаўнікоў на кангрэс 28–29 лютага 1922 г. у Рызе, а таксама падрыхтаваць звесткі пра патрэбы беларускай вучнёўскай моладзі[479]. Пры пасрэдніцтве Беларускага нацыянальнага камітэта ў Чыкага 4 ліпеня 1923 г. БША звярнуўся ў Амерыканскі чырвоны крыж з просьбай дапамагчы беларускім школам у Латгаліі вопраткай, абуткам, лекамі, школьнымі матэрыяламі (сшыткамі, алоўкамі). У лісце адзначалася, што беларускія раёны Латвіі з'яўляюцца не толькі самымі беднымі і пацярпелымі ад вайны, але таксама – найбольш адсталымі ў культурным сэнсе[480]. Да звароту быў далучаны спіс 10 беларускіх школ, якія адчувалі вострую патрэбу ў матэрыяльнай дапамозе[481]. Па-за тым Беларускі школьны аддзел прасіў беларускі чыкагскі камітэт падтрымаць беларускіх дзяцей у Латгаліі, а таксама параіць, дзе ў ЗША можна атрымаць дапамогу[482]. 30 чэрвеня 1923 г. становішчам беларускай меншасці зацікавілася італьянскае дыпламатычнае прадстаўніцтва ў Латвіі[483]. 10 ліпеня 1923 г. БША звярнуўся да кіраўніцтва Метадысцкай царквы ў Рыме з просьбай падтрымаць

476 LVVA, 2125 f., 5 apr., 34 l., 213 lp.
477 НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 46, л. 9; Тамсама, спр. 48, л. 10.
478 LVVA, f. 2125, apr. 5, l. 103, 6 lpp.
479 LVVA, 2125 f., 5 ap., 258 l., 12 lp.; LVVA, 2125 f., 5 ap., 393 l., 12 lp.
480 LVVA, 2125 f., 5 ap., 258 l., 38 lp.; LVVA, 2125 f., 5 ap., 393 l., 64 lp.
481 LVVA, 2125 f., 5 ap., 393 l., 13–14 lpp.
482 LVVA, 2125 f., 5 ap., 258 l., 60 lp.
483 LVVA, 2125 f., 5 ap., 258 l., 65 lp.

беларускія школы ў Латвіі[484]. 17 жніўня 1923 г. Беларускі школьны аддзел падаў інфармацыйную даведку пра беларусаў Латвіі на запыт урада Італіі ад 30 красавіка 1923 г. У дакуменце быў сціслы агляд нацыянальна-культурнай і асветнай дзейнасці мясцовых беларусаў, а таксама звярталася ўвага на складанае мінулае беларусаў, якія цягам шматвекавой гісторыі знаходзіліся пад прыгнётам суседзяў[485]. Замежная дапамога была, аднак, абмежаванай, таму не магла істотна палепшыць матэрыяльныя ўмовы беларускіх школ.

Навучальны працэс. Стан выкладання беларускай мовы. Школьным жыццём кіравала школьная рада, у склад якой уваходзіў дырэктар, школьны доктар, прадстаўнікі настаўнікаў і бацькоў (па адным на клас)[486]. Навучальныя праграмы ў школах для нацыянальных меншасцей адпавядалі тым, якія былі ў латышскіх школах, але ўлічвалі мясцовую спецыфіку. У першыя гады існавання беларускія школы не мелі распрацаваных навучальных праграм. Па "небеларускіх" прадметах школы кіраваліся праграмамі латышскіх школ[487].

Асаблівасцю беларускіх школ была прысутнасць у навучальных праграмах прадметаў па роднай мове і беларусазнаўстве. Апошні складаўся з ведаў пра гісторыю, культуру і геаграфію Беларусі. 11 сакавіка 1922 г. кіраўнік Беларускага школьнага аддзела накіраваў дырэктарам беларускіх школ ліст, у якім чытаем: "*Маючы на ўвазе, што ўсялякая школа павінна гадаваць у маладым пакаленні любоў ка ўсяму роднаму і блізкаму, Беларускі Аддзел кіруе Вам пагляд на тое, што выкладанне ў беларускіх школах гісторыі, этнаграфіі і геаграфіі Беларускага Краю, адным словам беларусазнаўства, з'яўляецца адным з важнейшых спосабаў прабуджэння народнага самазнання. На лекцыях беларусавядомасці па належных крыніцах патрэбна болей дробна спыняцца на гісторыі многапакутнага беларускага народа, на яго родзе, бесперарыўнай барацьбе ад чужых уплываў, на яго мове, рабоце і т.п. Вельмі жадана, каб вучні пад кіраўніцтвам вучыцялей запісвалі і збіралі беларускія песні; усялякія апавяданні, легенды, казкі і т.п.*"[488]. У кастрычніку 1922 г. кіраўніцтва БША разаслала кіраўнікам школ цыркуляр, у якім звяртала ўвага на ўвядзенне (там, дзе яшчэ не было) абавязковага прадмета па беларусазнаўстве ў памеры не менш трох гадзін у тыдзень у кожным класе. У дакуменце чытаем: "*На гэтых лекцыях, гледзячы на мясцовыя варункі жыцця (…),*

---

[484] LVVA, 2125 f., 5 ap., 393 l., 57 lp.

[485] У дакуменце чытаем: "*Трагическая борьба белорусского народа за свое национальное существование красной нитью проходит через всю его историю с первых веков до последней европейской войны*". LVVA, 2125 f., 5 ap., 393 l., 65–66 lpp.

[486] LVVA, 2125 f., 5 ap., 87 l., 9 lp.

[487] LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 57 lp.

[488] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 47, л. 9.

неабходна паступова пазнаёміць дзяцей з гісторыяй, геаграфіяй і этнаграфіяй Беларусі, беларускай мовай, завучваннем з дзецьмі на памяць больш лёгкіх і цікавых сціхатварэнняў з беларускіх хрэстаматыяў, паказаць дзецям беларускія дзіцячыя гульні, вучыць некалькі беларускіх песняў і г.д. Наагул абудзіць у дзецях каханне к свайму роднаму Беларускаму краю"[489].

Восенню 1922 г. Беларускі школьны аддзел разаслаў анкету, якая ўтрымлівала звесткі адносна вывучэння ці невывучэння беларусазнаўства[490]. Тым часам, звесткі, якія прыходзілі ў БША з правінцыйных школ, сведчылі пра нездавальняючы стан выкладання беларусазнаўства. У лістападзе 1922 г. інспектар К. Езавітаў пісаў у БША: "*Кіраўнікі некаторых беларускіх школак не толькі не ўстанавілі ў расклад лекцыі беларускае мовы, але, нават, як, напрыклад, у Розенаўскай Беларускай Школе, не ўключылі і часоў беларусазнаўства. З гэтага поваду Люцынская Управа ўжо здзекавалася з нас, бо і ў самым дзелі якая ж гэта беларуская школа, у якой няма нічога беларускага*"[491]. 14 красавіка 1923 г. кіраўніцтва БША звяртала ўвагу кіраўніка Зілупскай школы на патрэбу "прайсці хоць бы эпізадычна" курс гісторыі Беларусі (па падручніку У. Ігнатоўскага) і геаграфіі Беларусі (па падручніку А. Смоліча) і ўключыць гэтыя прадметы ў праграму іспытаў[492].

Праблемай была і адсутнасць адпаведных навучальных праграм. 25 лютага 1923 г. нарада настаўнікаў Даўгаўпілса даручыла распрацоўку праграмы па гісторыі Беларусі – І. Краскоўскаму, па геаграфіі Беларусі – А. Якубецкаму, па граматыцы і сінтаксісе беларускай мовы – П. Мядзёлцы-Грыб[493]. Справу інструктавання працы беларускіх школ, асабліва ў галіне прадмету беларусазнаўства, у сакавіку 1923 г. Міністэрства асветы даручыла К. Езавітаву (у Лудзенскім павеце) і У. Пігулеўскаму (у Даўгаўпілскім павеце)[494]. 20 красавіка 1923 г. на прапанову К. Езавітава Рада БША прыняла зварот да міністра асветы з просьбай ускласці абавязак інструктавання школ на педагагічны склад Даўгаўпілскай (у Даўгаўпілскім і Ілукштанскім паветах) і Лудзенскай (у Лудзенскім і Рэжыцкім паветах) гімназій[495]. 22 красавіка 1923 г. Рада БША вырашыла азнаёміцца са школьнымі праграмамі іншых меншасцей, а потым даручыць педрадам Даўгаўпілскай і Лудзенскай гімназій распрацоўку ўласных[496]. 6 траўня 1923 г. сход настаўнікаў беларускіх школ Пасіенскай волаcці вырашыў прыраўняць праграмы па агульнаадукацыйных прадметах да

[489] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 47, л. 17.
[490] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 47, л. 21.
[491] LVVA, 2125 f., 5 ap., 232 l., 9 lp.
[492] LVVA, 2125 f., 5 ap., 232 l., 42 lp.
[493] LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 60 lp.
[494] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 43, л. 11.
[495] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 8 lp.
[496] LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 84 lp.

праграм латышскіх школ. Што тычыцца праграм па гісторыі, геаграфіі і мовах, дык удзельнікі сходу прасілі Беларускі школьны аддзел распрацаваць уласную праграму[497].

Яшчэ большай праблемай было недастатковае навучанне роднай мовы. Адсутнасць неабходнай колькасці падрыхтаваных настаўнікаў і нястача беларускамоўнай літаратуры быў прычынай таго, што толькі ў частцы школ навучанне ішло па-беларуску. У яшчэ данядаўна рускіх школах нават беларусазнаўства (гісторыя і геаграфія Беларусі) выкладаліся па-руску[498]. Беларускі школьны аддзел інфармаваў кіраўнікоў школ, што беларуская мова павінна ўводзіцца ў навучанне паступова: у 1921/21 гг. як асобны прадмет (чытанне вершаў, спяванне песень), а з 1922/23 гг. – як мова навучання[499]. Поспехі беларускамоўнага навучання залежалі ад прысутнасці ў школах настаўнікаў, якія праслухалі беларускія настаўніцкія курсы. У сувязі з іх нястачай, на першым этапе працы беларускіх школ БША вырашыў дазволіць навучанне на рускай мове да канца 1921/22 гг., да моманту, калі будуць падрыхтаваныя новыя настаўніцкія кадры. Дзякуючы першаму выпуску 1-гадовых беларускіх настаўніцкіх курсаў, ва ўсіх беларускіх школах Даўгаўпілшчыны беларуская мова была ўведзена як прадмет, а ў большасці з іх пачалі выкладаць па-беларуску. Выпускнікі замянілі старых настаўнікаў, якія не ведалі беларускай мовы[500]. Кастусь Езавітаў сцвярджаў, што 60% беларускіх школ у Даўгаўпілскім павеце на пачатку 1922/23 гг. цалкам перайшло на беларускую мову навучання, а пераход астатніх з'яўляецца справай найбліжэйшага часу. Ён звяртаў увагу, што ў школах іншых нацыянальнасцей, у тым ліку ў латышоў, у пераходны перыяд часова таксама выкарыстоўвалася руская мова[501]. 23 красавіка 1923 г. Рада БША ўхваліла план цягам першага паўгоддзя 1923/24 гг. цалкам перавесці беларускія школы на родную мову навучання[502].

Аднак факты сведчаць, што вывучэнне як беларускай мовы, так і іншых прадметаў пакідалі жадаць лепшага. Пацвярджаюць гэта назіранні справавода Беларускага школьнага аддзела і беларускага школьнага інспектара, якія нярэдка ўтрымлівалі супярэчлівую інфармацыю[503]. З назіранняў БША

---

[497] LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 87 lp.

[498] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 110, л. 2.

[499] LVVA, 2125 f., 5 ap., 139 l., 6 lp.

[500] LVVA, 2125 f., 5 ap., 39 l., 71 lp.

[501] К. Езавітаў, *Становішча беларускае школы ў Латвіі*, Вільня 1923, с. 21, 26.

[502] LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 78–79 lpp.

[503] 11 верасня 1922 г. К. Езавітаў пісаў у БША наконт сітуацыі ў школах у Пустынскай і Прыдруйскай валасцях Даўгаўпілшчыны: "*У Прыдруйскай і Пустынскай волассцях Дзвінскага павету ў прошлым годзе адчынена было 14 беларускіх школ (...) К сажаленію не ва ўсіх гэтых школах былі назначаны вучыцелі-беларусы, а таму не ва ўсіх школах была магчымаць выкладаць беларускую мову* (...) *у некаторых школах, карыстаючыся векавечнай цемнатой і несвядомасцю*

вынікала, што з 14 беларускіх школ Даўгаўпілшчыны толькі ў трох (Прыдруйскай, Пустынскай і Максімаўскай) чуваць былі галасы супраць навучання беларускай мовы[504]. На падставе аналізу справаздачы К. Езавітава (снежань 1922 г.) можна зрабіць выснову, што навучанне на беларускай мове адбывалася толькі ў школах Пустынскай (Юхнявецкай, Плейкаўскай, Карклінскаўскай, Шнекаўскай, Зяленчынскай) і Прыдруйскай (Вайцюлеўскай, Зарэцкай і 2-й Прыдруйскай) валасцей. Пры гэтым у 2-й Прыдруйскай школе навучанне вялося як па-беларуску, так і па-руску[505]. 15 снежня 1922 г. К. Езавітаў праінспектаваў гэту школу. Агульныя вынікі былі пазітыўныя. Асабліва інспектар адзначаў, што вучні робяць поспехі ў навучанні. Разам з тым, ён

беларускага сялянства, элементы варожыя беларускаму нацыянальнаму адраджэнню (польская шляхта, расейскае вучыцельства) пастараліся ўнушыць беларускаму населенію, што яно не павінна вучыцца беларускай мове, бо мова гэта 'простая' ды і так ужо добра ім вядомая, а што трэба вучыцца мове расейскай і польскай. У тых школах, дзе вучыцелі самі варожа адносіліся да беларускага нацыянальнага руху, прапаганда гэта мела ўспех. І вось ад трох з гэтых школак паступіла просьба аб тым, каб у іх была скасавана мова беларуская, а пакінуты толькі гэткія мовы: латышская як дзяржаўная, расейская і польская (...) у трох школах большасць бацькоў (праўда, не ўсе бацькі былі на сходзе) выказалася за тое, каб беларускай мовы не было; прычым гэтыя-ж самыя бацькі адзначылі, што яны беларусы і дома гутараць па-беларуску; трудна адшукаць 'што' і якая логіка кіравала імі ў гэтай заяве, але, як я потым даведаўся, нехта пусьціў слух, што калі будзе беларуская мова у школе, дык яна будзе і ў касцёле, а процію гэтага і ксяндзы, і рэлігійныя бацькі-каталікі. Такім чынам, дзе здарылася тое, што ў 3-х беларускіх школах, дзе вучацца толькі дзеці беларусаў, вынесена пастанова (можа быць і часовая) супраць выкладання мовы беларускай і за выкладаннем вышэйпамянутых трох моваў. Паўстае пытанне: ці астаўляць гэтыя школы ў Беларускім Аддзеле ці перадаваць іх Расейскаму, або Польскаму Аддзелу. Мне здаецца, і бараніў гэты погляд перад Школьнай Радай і Камісіяй, што школы павінны астацца ў Беларускім Аддзеле, бо дзеткі беларусаў не павінны падвяргацца аканчацельнай русіфікацыі і паланізацыі. Жаданне бацькоў наконт мовы ў гэтым годзе Беларускі Аддзел мог-бы споўніць, але школы беларускія павінны былі-б астацца за Беларускім Аддзелам, з тым, штоб даць ім на гэты год хоць нацыянальнае выхаванне, нацыянальны дух, а затым у будучым годзе будзе можна ўжо перайсці і да беларускае мовы. Зусім зразумела, што пры пераходзе беларускіх дзетак у другі Аддзел яны будуць выхаваны варожа да ўсяго беларускага і русіфікацыя і паланізацыя, пусціўшыя глыбокія карані, будзе і далей цягнуцца (...) Сколькі мне вядома, і ў саміх латышоў былі гэткія здарэнні, што бацькі жадалі вучыць сваіх дзетак не ў латышскай, а ў нямецкай, расейскай і польскай мовах. Латышы ішлі на спатканне гэтым просьбам, каб не абвастраць адносін са сваімі несвядомымі элементамі і не адкідаць іх аканчацельна. Мне здаецца, што і мы мусімо пайсці на гэты кампраміс, але трэба, каб гэтыя школы засталіся ў нашым кіраванні (...) Падкрэсліваю, што калі тутака справа намі будзе прайграна і гэтыя школы ад беларусаўу адыдуць, ці гэтыя вучыцелі астануцца, дык гэта будзе пачаткам таго што палякі пачнуць у хаўрусе з маскалямі заваёўваць у нас школу за школай і русіфікацыя і паланізацыя нашых дзетак, якая ўжо пачынала намі спыняцца, зноў расцвіце пышнай кветкай". LVVA, 2125 f., 5 ap., 39 l., 57–59 lpp.

[504] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 43, л. 5–6.

[505] LVVA, 2125 f., 5 apr., 42 l., 276 lp.

лічыў, што неабходна павялічыць колькасць гадзін беларускай мовы, а настаўнікі павінны праслухаць курсы беларусазнаўства[506]. Наступным чынам ён характарызаваў сітуацыю ў Плейкаўскай школе: "*выкладовая мова – беларуская, але апрач яе выкладаюцца мовы: латышская, расейская і польская. Закон Божы быў усяго адзін раз за ўвесь час, бо школа знаходзіцца на пустынскай парафіі ў кс. Таборэ, якому дужа далёка ездзіць*"[507]. Добрае ўражанне на К. Езавітава зрабіла Рагойжская школа, у якой інспектар сцвердзіў, што "*беларуская мова выкладаецца як прадмет, дзеткі старэйшых і малодшых класаў чытаюць і прамаўляюць, а таксама і кажуць вершы даволі добра; цікава тое, што на пераменах яны самі без вучыцелек спяваюць беларускія народныя спевы і гуляюць пад іх у беларускія дзіцячыя гульні*"[508]. У дачыненні да Бяляеўскай школы, аўтар рапарту адзначыў, што вучні 4-га класа "коечто отвечали на белорусском языке"[509].

Пра навучальны працэс і вывучэнне беларускай мовы ў беларускіх школах дае таксама пэўнае ўяўленне справаздача справавода Беларускага школьнага аддзела Я. Шчорса, які 19–23 сакавіка 1923 г. адбыў інспекцыю ў Пасіенскай воласці. Пасля візітацыі 17 сакавіка 1923 г. беларускі дзеяч не быў у захапленні ад Дэгелеўскай школы, пішучы, што навучанне адбывалася на рускай мове, бо настаўнік Л. Цімашэнка яшчэ не праслухаў курсаў беларусазнаўства. Пры гэтым ён адзначаў, што вучні "*вельмі частка гавораць беларускія словы, але вучыцель іх папраўляе*"[510]. У выніку праверкі ў сакавіку 1923 г. К. Езавітаў сцвердзіў, што вельмі высокі ўзровень навучання быў у Ляўдарскай школе (кіраўнік Астап Хруцкі), дзе працавалі дасведчаныя старыя настаўнікі з педагагічнай падрыхтоўкай царскай Расіі[511]. 22 сакавіка 1922 г. інспектар наведаў Блукаўшчынскую школу, падчас інспекцыі якой сцвердзіў, што "*выкладанне вядзецца на расейскай мове, бо вучыцелька не праслухала курсаў беларусазнаўства, аднак мова беларуская як асобны прадмет выкладаецца і вучні чытаюць добра*"[512]. Тым часам, даволі нізкі ўзровень навучання быў у Шэшкаўскай школе. У справаздачы інспектара чытаем: "*Праграма яшчэ не праробленa, асабліва па матэматыцы, і над ёй трэба будзе яшчэ шмат папрацаваць, без усваення праграммы па матэматыцы няможна будзе пераводзіць вучняў у старэйшыя класы; Беларуская мова выкладаецца ва ўсіх класах, а пройдзена дужа мала, дзякуючы таму, што кіраўнік школы сам мала*

[506] LVVA, 2125 f., 5 apr., 171 l., 16 lp.
[507] LVVA, 2125 f., 5 ap., 175 l., 10 lp.
[508] LVVA, 2125 f., 5 apr., 200 l., 5 lp.
[509] LVVA, 2125 f., 5 apr., 34 l., 212 lp.
[510] LVVA, 2125 f., 5 apr., 128 l., 2 lp.
[511] LVVA, 2125 f., 5 ap., 159 l., 16 lp.
[512] LVVA, 2125 f., 5 apr., 112 l., 5 lp.

падгатоўлены па гэтым прадмеце; Гісторыя і геаграфія Латвіі пастаўлена дужа слаба, і некаторыя вучні ня могуць нават паказаць асноўных частак тэррыторыі Латвіі; Трэба звярнуць большую ўвагу і на спевы, асабліва на беларускія песні"[513].

Пасля наведвання Зілупскай школы Я. Шчорс адзначаў: "*Вучні нямнога гавораць па-беларуску, чытаюць вершы і спяваюць некаторыя песні на гэтай жа мове, агулам жа беларуская мова яшчэ не ўвайшла ва ўжыванне, за тым, што вучні па інерцыі трымаюцца велікарускае мовы, а вучыцелі – расейцы, незнаёмыя з беларускай гаворкай. У бяседзе з вучыцелямі зроблена ім прапанаванне прыняць удзел у стварэнні культурнага вучыцельскага фонду, у выданні беларускага альманаха, рэкамендавана абмеркаваць пытанне аб арганізацыі настаўніцкай ці вучнёўскай агульнай экскурсіі, завесці школьную летапісь, збіраць беларускі этнаграфічны матэрыял, зроблена ўвага на неабходнасць да 31 снежня 1923 года вытрымаць іспыт па латышскай мове, а таксама і знаёміцца з беларускім языком. (Пасіенская) Беларуская мова па многіх прычынах слаба ў школе, і толькі некаторыя вучні гавораць беларускія вершы. Выкладанне вядзецца на расейскай мове і паспех вучняў у агульным можа лічыцца задавальняючым пры існуючых варунках жыцця школы. Пры агульнай беднасці і коснасці мясцовага жыхарства школа патрабуе матэрыяльнай падтрымкі на здабыванне кніжак і навуковых дапамог (...) На лічбу вучняў маюць і будуць мець уплыў мясцовыя польскія школы*"[514]. Справавод БША станоўча ацэньваў навучанне ў Лунеўскай школе, у якой "*ученики 3 отделения читали по-белорусски, они же, как и ученики других отделений, удовлетворительно производили устные вычисления и прилично пропели несколько песенок на белорусском и латышском языках*"[515]. А вось як Я. Шчорс пісаў пра Ляўзінскую школу: "*Надзвычайным было бачыць і вучняў 14 гадоў, сядзеўшых у першым аддзяленні, дзе звычайны сядзяць дзеці 8–10 гадоў. Пры азначанай абставе школы трудна шукаць, аднак жа вучні старшага аддзялення пад кіраўніцтвам энергічнай вучыцелькі Пужул Ганны бойка, хоць і з грубым беларускім акцэнтам, чыталі па буквары*"[516]. На думку беларускага дзеяча, у Чыўчынскай школе вучні таксама мелі прагрэс у навучанні, у тым ліку па беларускай мове, але настаўнікі скардзіліся на адсутнасць падручнікаў і навучальных матэрыялаў. Нягледзячы на кепскія матэрыяльныя ўмовы, вучні ўсіх класаў чыталі і спявалі па-беларуску. Адначасова ён адзначаў, што жыхары Пасіенскай воласці праз сваю

[513] LVVA, 2125 f., 5 apr., 212 l., 14 lp.

[514] LVVA, 2125 f., 5 apr., 34 l., 210 lp.; LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 61–62 lpp.

[515] LVVA, 2125 f., 5 apr., 34 l., 212 lp.

[516] *Да гісторыі Келаўскае пачатковае школы*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1927, № 4(2), с. 44–46.

незаможнасць, нізкі культурны ўзровень і неразуменне значэння асветы ў жыцці чалавека, абыякава ставяцца да наведання іх дзецьмі школы[517].

Пра нежаданне некаторых настаўнікаў выкладаць беларускую мову і беларусазнаўства сведчыць факт, што школьная рада Зілупскай школы звярнулася ў БША з просьбай вызваліць ад беларусазнаўства вучняў, якія не з'яўляюцца беларусамі паводле нацыянальнасці[518]. Аднак пад уплывам К. Езавітава было вырашана ўвесці заняткі беларусазнаўства ў памеры двух лекцый у тыдзень для ўсіх ахвотных вучняў[519].

21–23 красавіка 1923 г. у Даўгаўпілсе адбыўся сход Рады БША з падвядзеннем вынікаў першага этапу дзейнасці беларускіх школ у Латвіі[520]. Удзельнікі прынялі рашэнне аб канчатковым пераходзе ад 1 студзеня 1924 г. усіх беларускіх школ на беларускую мову навучання[521]. 20–21 красавіка 1923 г. на пасяджэнні Беларускага школьнага аддзела было вырашана замяніць настаўнікаў, якія непрыхільна ставяцца да беларускай мовы і культуры, а таксама на працягу першай паловы 1923/24 гг. перавесці на беларускую мову навучання тыя школы, у якіх яно ішло на іншых мовах[522]. Каб паспрыяць гэтаму, 9 чэрвеня 1923 г. БША звярнуўся да кіраўнікоў беларускіх школ з прапановай камандзіраваць прынамсі па адным настаўніку на летнія курсы беларусазнаўства. Асоб, якія адмовіліся скарыстацца такой магчымасцю, імкнуліся пераводзіць у школы іншых нацыянальнасцей. Напрыклад, 31 жніўня 1923 г. Беларускі школьны аддзел звярнуўся ў Агульны школьны дэпартамент з просьбай перавесці настаўніка Л. Цімашэнку ў адну з рускіх школ, а замест яго прызначыць у Дэглеўскую школу настаўніка-беларуса[523]. Захады беларускага асветнага кіраўніцтва па пераводзе школ на родную мову далі плён. У рэфераце кіраўніка БША за 1922/23 гг. адзначалася, што "*Праца Аддзела ў бягучым вучэбным годзе цякла і цячэ ў вельмі цяжкіх варунках і можа быць у больш цяжкіх, чым у першы год свайго існавання. Тлумачыцца гэта цэлай чарадой прычын, і галоўная з іх была тая, што Аддзел у бягучым вучэбным годзе паставіў сваю працу на больш рэальныя асновы. З пачатку гэтага вучэбнага года беларускія школы павінны былі здабываць характар нацыянальных школ не толькі па назве, але і па істоце. Блізка што ўсе 17 школ Дзвінскага павета ў 1922/23 вучэбным годзе перайшлі да беларускай мовы выкладання; у Люцынскім павеце пакуль што ўдалося, за невялікім*

[517] LVVA, 2125 f., 5 apr., 34 l., 213 lp.

[518] LVVA, 2125 f., 5 ap., 232 l., 87 lp.

[519] LVVA, 2125 f., 5 ap., 232 l., 91 lp.

[520] На мерапрыемстве з дакладамі выступілі: С. Сахараў, К. Езавітаў, І. Краскоўскі і А. Якубецкі. *У Латвіі*, "Крывіч" 1923, № 1, с. 58–59.

[521] Гуль, *Пісьмо з Латвіі*, "Змаганьне" 1923, № 12 ад 2 снежня 1923 г., с. 2.

[522] LVVA, 2125 f., 5 apr., 4 l., 6–14 lpp.

[523] LVVA, 2125 f., 5 apr., 128 l., 8 lp.

выняткам, увесці ў праграму школы выкладанне беларускай мовы, гісторыі і геаграфіі Беларусі"[524].

Праблемы з выкладаннем на беларускай мове былі "ахілесавай пятой" беларускіх школ і давалі нядобразычліўцам нагоду называць іх прыбудоўкай рускіх. Навучанне па-руску ў беларускіх школах непакоіла некаторых латвійскіх палітыкаў. На іх думку, беларускія школы нічым не розніліся ад рускіх і вялі русіфікацыю, а Беларускі школьны аддзел з'яўляўся філіялам Рускага. Гэта пытанне было прадметам дыскусіі падчас пасяджэння сеймавай асветнай камісіі. Дэпутаты правых партый крытыкавалі працу БША адзначаючы, што ў мурах падпарадкаваных яму школ пануе расейшчына. Кіраўнік аддзела С. Сахараў і інспектар К. Езавітаў тлумачылі гэта гістарычнымі асаблівасцямі развіцця беларускага народа[525]. Першы, адказваючы на крытыку дэпутата Сойму Францiса Кэмпса тлумачыў прычыну выкарыстання рускіх падручнікаў у беларускіх школах нядаўнім іх падпарадкаваннем Рускаму школьнаму аддзелу[526].

Аналіз даступных крыніц дазваляе сцвярджаць, што ўвядзенне беларускіх прадметаў ішло паступова. Дадзены працэс можна прасачыць на прыкладзе Зілупскай 6-класнай беларускай школы, у якой працавала 6 настаўнікаў і навучалася 270 вучняў, а заняткі адбываліся ў дзве змены. Пасля перадачы школы ў распараджэнне БША ў 1922 г. назіралася пэўная незадаволенасць з боку бацькоў, асабліва каталікоў, якія патрабавалі польскай школы. У сувязі з гэтым настаўнікі мусілі вельмі асцярожна ўводзіць прадметы па беларускай мове і беларусазнаўстве. З назірання беларускіх школьных улад вынікае, што ў 1922/23 гг. вучні старэйшых клас азнаёміліся з гісторыяй і геаграфіяй Беларусі, чыталі па-беларуску артыкулы і аповесці, развучвалі вершы і песні. Кіраўніцтва школы планавала ў наступным навучальным годзе

---

[524] LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 67 lp.

[525] Падводзячы вынік першых гадоў працы беларускіх школ, належыць пагадзіцца з К. Езавітавым, які пісаў: "*Год працы беларускай школы давёў яе жыццёвую неабходнасць і пераканаў ініцыятараў яе паяўлення ў тым, што яны не напрасна паднялі свой голас у абарону інтарэсаў найбольш адсталай часткі латвійскіх грамадзян – беларускай нацыянальнай меншасці. Тыя дакоры, якія сыпаліся на Беларускі Аддзел за часовае карыстанне расейскай мовай для выкладання ў беларускіх школах, цяпер, з пераходам першай партыі беларускіх школ на выкладанне на беларускай мове, у значнай ступені адпадаюць, а ў будучым годзе і зусім адпадуць. А калі мы яшчэ прыпомнім, што не толькі ў беларускіх школах, але таксама і ў школах іншых меншасцёў, а часам нават і ў латышскіх нацыянальных школах абставіны школьнага жыцьця патрабавалі і патрабуюць часова карыстання расейскай мовай як мовай выкладовай, – дык гэтае абвінавачванне, ужо і сённека, зусім адпадае. Існуючыя ў беларускіх школах недахваты ў значнай меры агульныя з недахватамі іншых школ у Латгаліі, і можна іх будзе пазбыцца ў бліжэйшыя гады, па меры наладжвання агульнага жыцця Латгаліі*". К. Езавітаў, *Становішча беларускае школы ў Латвіі*, Вільня 1923, с. 26.

[526] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 51, л. 17–19; LVVA, 2125 f., 5 ap., 104 l., 9–11 lpp.

надаць больш увагі беларусазнаўству[527]. Кіраўнік Стара-Слабадской школы ў лісце К. Езавітаву пісаў, што беларускую мову належыць "паціху ўвадзіць як з песняў, з тэатру і з вершаў"[528]. 8 студзеня 1924 г. кіраўніцтва Беларускага школьнага аддзела інфармавала кіраўніка Жакелаўскай школы, што яно гатова падпарадкавацца волі бацькоў, каб як прадмет у поўным аб'ёме выкладалася польская мова, якая адначасова была мовай прадмету па каталіцкай рэлігіі. Адначасова звярталася ўвага на тое, што "*не трэба бацькам адмаўляцца ад сваёй роднай мовы, тым больш, што іх дзетак вучаць у школе і другім мовам (латышскай, расейскай), якія патрэбны будуць у іх жыцці*"[529].

У красавіку 1924 г. Беларускі школьны аддзел заклікаў настаўнікаў, якія яшчэ не праслухалі курсаў беларусазнаўства, каб неадкладна гэта зрабілі, паколькі ад гэтага будзе залежаць іх кар'ера ў беларускіх школах[530]. 26 ліпеня 1924 г. Рада БША вырашыла, што ўсе настаўнікі, якія не праслухалі раней курсаў, мусілі 20–25 верасня 1924 вытрымаць іспыт па праграме-мінімум, які ахоплівaў веды на падставе падручніка *Родны край* у 2-х частках і *Зорка*, кароткай граматыкі, дыктоўкі і пераказу па тэме выбранай экзаменатарам. Склад камісіі выглядаў наступным чынам: кіраўнік БША С. Сахараў, П. Мядзёлка-Грыб (экзаменатар), па адным прадстаўніку настаўніцтва пачатковых школ Даўгаўпілскага і Лудзенскага паветаў[531].

У звароце Беларускага школьнага аддзела адзначалася, што адмова ад здачы іспыту будзе разглядацца як "нежаданне навучыцца беларускай мовы"[532]. На пачатку 1924/1925 гг. С. Сахараў інфармаваў, што ўсе беларускія школы ў Даўгаўпілскім павеце цалкам перайшлі на беларускую мову навучання, а на Лудзеншчыне яшчэ не. Ва ўсіх беларускіх школах Латгаліі выкладаўся абавязковы прадмет беларусазнаўства[533].

Навучанне роднай мовы адбывалася ў двух варыянтах – кірылічным і лацінскім. Апошні дапускаўся ў школах, дзе пераважалі вучні-каталікі[534]. Былі таксама выпадкі, калі ў школе практыкаваліся два варыянты адначасова. У адной са школаў у Пустынскай воласці, якую ў красавіку 1922 г. наведаў К. Езавітаў, у першых трох малодшых класах заняткі адбываліся па-беларуску, а ў двух старэйшых – па-руску. Пры тым беларуская мова вывучалася ў першых двух класах – у лацінскім варыянце, а ва ўсіх астатніх –

---

527 LVVA, 2125 f., 5 apr., 34 l., 196 lp.
528 LVVA, 2125 f., 5 apr., 53 l., 8 lp.
529 LVVA, 2125 f., 5 ap., 136 l., 39 lp.
530 LVVA, 2125 f., 5 ap., 68 l., 15 lp.
531 LVVA, 2125 f., 5 apr., 4 l., 28 lp.; LVVA, 6845 f., 2 ap., 4 l., 121 lp.
532 LVVA, 2125 f., 5 ap., 72 l., 23 lp.; LVVA, 2125 f., 5 apr., 4 l., 28 lp.
533 НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 167, л. 8; LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 1–5 lpp.
534 LVVA, 2125 f., 5 apr., 38 l., 193 lp.

у кірылічным[535]. Прысутнасць першага насцярожвала К. Езавітава, які пасля інспекцыі Плеўкаўскай школы 13 снежня 1922 г. выказаў пажаданне, каб вучні вывучалі беларускую мову не толькі "лацінку, але і грамадзянку". Насцярога беларускага дзеяча вынікала з таго, што лацінка можа пагражаць паланізацыяй вучняў[536].

Завяршаючы аналіз навучання беларусазнаўства і беларускай мовы неабходна адзначыць, што адным з фактараў, якія яго ўскладнялі, была нястача беларускамоўных падручнікаў і дапаможнікаў. На першым этапе існавання беларускіх школ пры вывучэнні агульнаадукацыйных прадметаў выкарыстоўваліся рускія падручнікі. Тым часам, настаўніцтва працягвала адчуваць вострую нястачу літаратуры на роднай мове. У сувязі з гэтым педагогі беларускіх школ Пустынскай воласці прасілі К. Езавітава забяспечыць іх беларускімі падручнікамі. Пры гэтым настаўнік В. Дзяргач абавязаўся пашырыць атрыманыя ад інспектара падручнікі сярод настаўнікаў Пустыншчыны[537].

Каб як мага хутчэй вырашыць пытанне, К. Езавітаў спрабаваў замовіць адпаведную літаратуру з-за мяжы. У першую чаргу ён мог разлічваць на дапамогу заходнебеларускіх і літоўскіх калег[538]. 18 красавіка 1921 г. К. Езавітаў звярнуўся да аднаго з кіраўнікоў Цэнтральнай беларускай школьнай рады (ЦБШР) у Вільні Міхала Какановіча з просьбай дапамагчы падручнікамі і іншай літаратурай. Дапамагаў латвійскім беларусам і Сымон Рак-Міхайлоўскі, які тады быў дырэктарам настаўніцкай семінарыі ў Барунах. Міністэрства асветы Латвіі выдаткавала 199 165 рублёў на закуп падручнікаў і літаратуры для беларускіх школ. За гэтыя грошы Беларускі школьны аддзел замовіў праз камерсанта Граніцкага партыю кніг у віленскім Беларускім навуковым таварыстве (БНТ)[539].

Таксама беларускі актыў рабіў захады атрымаць навучальную літаратуру з ЗША. 17 лютага 1922 г. Беларускі аддзел звярнуўся ў Амерыканскі

---

[535] LVVA, 2125 f., 5 ap., 136 l., 7 lp.

[536] LVVA, 2125 f., 5 ap., 175 l., 10 lp.

[537] LVVA, 2125 f., 5 apr., 135 l., lpp3–5.

[538] У красавіку 1921 г. К. Езавітаў пісаў знаёмаму ў Літве: "*Беларусаў тутака зарэгістравалася больш 50.000 (па латвійскаму перапісу). Усе яны карыстаюцца або расейскай, або польскай школай. Міністэрства Прасветы і Земства ідуць на спатканне думкам аб утварэнні беларускай школы, але хочуць, каб адчыненне яе ішло не зверху, а знізу па жаданні насельніцтва. Я ўжо гутарыў з настаўнікамі. Згаджаюцца, але просяць курсаў, літаратуры і падручнікаў. Каб былі падручнікі, дык некаторыя школы перайшлі-б на іх. Утварыў тутака Культ-Прасветнае Т-ва 'Бацькаўшчына', у якое вайшло шмат учыцельства. Вельмі прашу Вас срочна паведаміць ці не зможаце Вы ці хто іншы ўзяць на сябе чытанне беларускіх лекцый на летніх курсах і ці не зможа Карабач або хто іншы прывезці зараз жа літаратуры і падручнікаў*". НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 19, л. 11.

[539] LMAVB, Rankrasciu skyrius, f. 21/293, l. 1; LVVA, 2125 f., 5 apr., 42 l., 52 lp.; НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 110, л. 14.

чырвоны крыж з просьбай выслаць на патрэбы беларускай школьнай справы падручнікі на рускай мове. У выніку арганізацыя "International Committee of Young Men's Christian Associations" прыняла рашэнне выслаць беларусам некаторыя выданні[540].

У студзені і лютым 1922 г. Беларускі школьны аддзел атрымаў з Вільні 14 скрынь з літаратурай. Гэта было больш, чым латвійскія беларусы маглі набыць, таму разлік з БНТ стала прычынай фінансавых непаразуменняў[541]. 11 сакавіка 1922 г. кіраўнік БША паведаміў дырэктарам беларускіх асноўных школ, што можа забяспечыць іх падручнікамі і іншай літаратурай на беларускай мове. Кнігі знаходзіліся на складах у Лудзы, у будынку беларускай асноўнай школы (вул. Астроўская 22) – для Лудзенскага і Рэжыцкага паветаў, у Даўгаўпілсе – у памяшканні беларускіх настаўніцкіх курсаў (вул. Віцебская 16) – для Даўгаўпілскага і Ілукштанскага паветаў[542]. Падручнікі можна было таксама атрымаць у інспектара беларускіх школ у Даўгаўпілсе[543]. Акрамя падручнікаў з набытай літаратуры было сфарміравана каля 50 школьных бібліятэчак. Сярод выданняў, атрыманых з Вільні, былі кнігі: А. Кісялёва ў перакладзе Антона Луцкевіча (*Элементарная алгебра: прытарнаваная да вымогаў беларускіх сярэдніх школ,* Вільня 1921–1922), Францішка Аляхновіча (*Страхі жыцьця: драма ў 3 актах,* Вільня 1919), братоў Гарэцкіх (*Маскоўска-беларускі слоўнік,* Вільня 1920), Аляксандры Смоліч (*Зорка: беларуская граматыка,* Вільня 1921), Браніслава Тарашкевіча (*Беларуская граматыка для школ,* Вільня 1919), Янкі Станкевіча (*Nowy lemantar dla biełaruskich dzietak,* Вільня 1920), Леанілы Чарняўскай (*Дзяціныя гульні,* Вільня 1919 і *Родны край: другая пасля лемантара кніга да чытання,* Вільня 1919), Язэпа Лёсіка (*Наша крыніца: чытанне для беларускіх школ,* Менск 1920), Уладзіслава Галубка (*Апошняе спатканьне: драма ў 4 актах,* Вільня 1919) і інш.[544]

Дзякуючы гэтаму, да канца 1921/22 гг. кожная беларуская школа мела беларускую бібліятэчку[545]. Некаторыя былі даволі значнымі. Напрыклад, у бібліятэцы Станкевічаўскай школы, дзякуючы руплівасці настаўніцы

---

[540] Гэта былі кнігі: *Русский букварь* Вахтерова – 300, *Живое слово* Острогородского – 300, *Начальная физика* Баранова – 52, *Русская граматика* Свань – 200. LVVA, 2125 f., 5 ap., 258 l., 36–37 lpp.

[541] LMAVB, Rankrasciu skyrius, f. 21/293, l. 1; LVVA, 2125 f., 5 apr., 42 l., 52 lp.; НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 110, л. 14.

[542] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 47, л. 8.

[543] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 47, л. 17.

[544] LVVA, 2125 f., 5 apr., 38 l., 70 lp.

[545] А. Вабішчэвіч, *"Але ж шлях да свабоды старонка праложа!"* [у:] *Сыны і пасынкі Беларусі*, рэд. С. Барыс, Менск 1996, с. 323, 325; НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 110, л. 2.

Алены Дзямідавай[546], налічваліся 182 кнігі, атрыманыя ад інспектара беларускіх школ і Даўгаўпілскай гарадской бібліятэкі. Сярод кніг знаходзіліся і беларускамоўныя выданні для каталіцкіх набажэнстваў[547]. З даступных крыніц вынікае, што даволі вялікую бібліятэку (66 выданняў) мела беларуская школа ў Даўгаўпілсе, у якой былі перыёдыкі "Беларускі сьцяг" і "Часопісь", кнігі Гаўрылы Гарэцкага і Аркадзя Смоліча[548]. Праўда, у некаторых школах па-ранейшаму не хапала падручнікаў. Сведчыць пра гэта факт, што ў траўні 1922 г. дырэктар Даўгаўпілскай беларускай школы А. Якубецкі прасіў інспектара К. Езавітава перадаць яго ўстанове дапаможнікі *Зорка* і *Родны Край*[549]. Беларускі актыў Латвіі не перастаў рупіцца пра пошук навучальнай літаратуры па-за межамі краіны. 2 лістапада 1922 г. на падставе загаду МБС Літвы У. Пігулеўскі быў накіраваны ў камандзіроўку ў Даўгаўпілс з мэтай дастаўкі падручнікаў для беларускіх школ[550]. Аднак магчымасці закупу замежнай літаратуры былі абмежаваныя па фінансавых прычынах. У лістападзе 1924 г. кіраўніцтва БША інфармавала настаўніцтва, што аддзел больш не ў стане высылаць дармавыя падручнікі, таму раіў звяртацца ў мясцовыя школьныя ўправы, якія атрымалі ад Міністэрства асветы сродкі на набыццё падручнікаў для незаможных вучняў[551].

Атрыманая з-за мяжы літаратура не задавальняла цалкам патрэб беларускіх школ у Латвіі, паколькі не заўсёды адпавядала мясцовым умовам. Напрыклад, у падручніку геаграфіі Аркадзя Смоліча была завышаная колькасць беларусаў у Латвіі. У 1924 г. К. Езавітаў прапанаваў перавыдаць яго, прыстасаваўшы да мясцовых патрэб[552]. Беларускі актыў Латвіі разумеў патрэбу выдання мясцовых падручнікаў. Намаганнямі Беларускага школьнага аддзела ў 1922 г. пабачыў свет лемантар Аляксандры Смоліч *Зорка. Першая навука чытаньня і пісаньня для беларускіх дзетак*. Далейшае выданне падручнікаў ускладняла тое, што праграмы прадметаў у беларускіх школах толькі распрацоўваліся. Гэтая праца скончылася толькі напрыканцы 1922/23 гг.[553] Тым не менш, з бюджэту БША на 1923/24 гг. было прызначана 75 тыс. рублёў на выданне падручнікаў. У сувязі з гэтым на нарадзе даўгаўпілскіх настаўнікаў

---

[546] Алена Гаўрылаўна Дзямідава, нар. у 1893 г. у Даўгаўпілсе. У 1913 г. скончыла Даўгаўпілскую гімназію. У 1922 г. праслухала настаўніцкія курсы ў Даўгаўпілсе. Праваслаўная, руская, але добра ведала беларускую мову і ў ёй вяла ліставанне з К. Езавітавым.

[547] LVVA, 2125 f., 5 apr., 212 l., 2 lp.

[548] LVVA, 2125 f., 5 ap., 35 l., 29–30 lpp.

[549] LVVA, 2125 f., 5 ap., 125 l., 17 lp.

[550] LCVA, f. 67, ap. 1, b. 4, l. 29.

[551] LVVA, 2125 f., 5 ap., 72 l., 29 lp.

[552] LVVA, f. 2125, apr. 5, l. 418, 55 lpp.

[553] К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, Рыга 1927 [перадрук: Нью-Ёрк – Менск 2013, с. 87, 90; Ён жа, *Беларускае Культурна-Асьветнае Т-ва "Бацькаўшчына" ў Латвіі*, Рыга 1932, с. 17.

25 лютага 1923 г. было вырашана даручыць І. Краскоўскаму падрыхтоўку падручніка *Эпізодачны курс гісторыі Беларусі*, А. Якубецкаму – падручніка па геаграфіі, а П. Мядзёлцы-Грыб – кароткага курсу граматыкі і сінтаксіса беларускай мовы[554].

Справа, аднак, не зрушылася з месца. Напрыклад, заняткі па геаграфіі Беларусі адбываліся без падручніка[555]. У сувязі з гэтым 24 студзеня 1924 г. С. Сахараў звярнуўся да К. Езавітава з прапановай скласці ўласны падручнік па геаграфіі Беларусі, накшталт рускага падручніка Ю. Навасёлава. К. Езавітаў пагаджаўся, адзначыўшы, што кніга А. Смоліча ўтрымлівае недакладнасці наконт колькасці беларусаў у Латвіі – аўтар падаў завышаную лічбу, неадпаведную вынікам перапісу 1920 г. Кастусь Езавітаў сцвярджаў, што ён мог бы падрыхтаваць новы падручнік, але праз брак часу раіў звярнуцца да П. Мядзёлкі-Грыб альбо папрасіць віленскіх беларусаў (праз С. Рак-Міхайлоўскага) выдаць скарочаны і выпраўлены падручнік А. Смоліча[556]. Чарговы раз пытанне было ўзнята падчас пасяджэння Рады БША 26 ліпеня 1924 г., удзельнікі якога прызналі неабходным як мага хутчэй прыступіць да выдання падручнікаў. Асабліва адчувалася патрэба ў падручніку па геаграфіі Беларусі. Кіраўніцтву Беларускага школьнага аддзела было даручана весці перамовы з У. Пігулеўскім, які гатовы быў падрыхтаваць кнігу[557]. Гісторыя паказала, што перашкодай на шляху да рэалізацыі выдавецкіх задумаў стала нястача грошай. Праблема дэфіцыту навучальнай літаратуры на беларускай мове не знікла.

Настаўнікі. У першыя гады існавання беларускіх пачатковых школ у Латвіі ў іх працавала каля 100 настаўнікаў. Колькасць беларускіх педагогаў змянялася ў залежнасці ад дынамікі змены лічбы беларускіх школ. Больш дакладна гэтыя змены адлюстраваныя ў наступнай табліцы.

Табліца 22. Колькасць настаўнікаў беларускіх пачатковых школ у 1921–1925 гг.

Навучальны год	Даўгаўпілскі павет	Лудзенскі павет	Даўгаўпілс	Лудза	Краслава	Рыга	Разам
1921/22	23	68	-	8	-	0	99
1922/23	26	67	4	7	1	0	105
1923/24	28	54	4	6	1	7	100
1924/25	27	37	4	7	1	8	84

Крыніца: LVVA, 2125 f., 5 ap., 333 l., 57 lp.

[554] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 112, л. 1.
[555] LVVA, f. 2125, apr. 5, l. 106, 3 lp.
[556] LVVA, 2125 f., 5 ap., 251 l., 28 lp.
[557] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 27 lp.

Тыповы партрэт беларускага настаўніка ў Латвіі скласці даволі цяжка. Педагагічны склад беларускіх асноўных школ быў стракаты. Дзеля ўпарадкавання ведаў пра педагагічны склад, у траўні 1922 г. Беларускі школьны аддзел разаслаў па школах анкету, з дапамогай якой можна было вызначыць нацыянальны, канфесійны, прафесійны і іншы склад настаўнікаў[558]. У першыя гады існавання беларускіх школ большасць педагогаў складалі выхаванцы старой расійскай школы, якія скончылі 4-класныя гімназіі і 6-класныя рэальныя вучэльні, духоўныя семінарыі, настаўніцкія вучэльні ці жаночыя гімназіі. Значна меншую па колькасці групу складалі настаўнікі, якія атрымалі педагагічную адукацыю на беларускіх настаўніцкіх курсах. Толькі 10% педагогаў мела вышэйшую адукацыю. У якасці прыкладу можна ўзгадаць настаўніка сельскагаспадарчай сярэдняй школы Аляксея Арлова, які скончыў Гістарычна-філалагічны факультэт Варшаўскага ўніверсітэта і настаўніцу Няўлянскай школы Ядвігу Станкевіч, якая вучылася ў Парыжы, у Сарбоне[559]. Цікавую біяграфію меў кіраўнік 2-й Прыдруйскай школы Канстанцін Дубавік (нар. 10.09.1880 г., Вілейка), які ў 1900 г. вытрымаў іспыт на настаўніка пры Віленскай юнкерскай вучэльні, а ў 1901 г. здаў іспыт на настаўніка ў Вілейскай 6-класнай гарадской вучэльні; у 1911 г. ён праслухаў настаўніцкія курсы ў Віцебску, а ў 1921 г. скончыў курсы беларусазнаўства ў Даўгаўпілсе[560].

У шэрагу школ працавалі сямейныя пары. Напрыклад, настаўнікамі Залескай беларускай школы былі Еўдакім і Домна Красцьянцавы, беларусы з Себежчыны, якія да 1918 г. настаўнічалі на Рэжыччыне[561]. Іншым такім прыкладам былі Канстанцін Александровіч і Люцыя Габран (у шлюбе Александровіч), Андрэй Якубецкі і Антаніна Антонава (у шлюбе Якубецкая). У двух апошніх выпадках пары пабраліся шлюбам, быўшы настаўнікамі беларускіх школ.

Некаторыя настаўнікі не мелі адпаведных дакументаў, якія пацвярджалі іх прафесійную кваліфікацыю. У сувязі з гэтым згодна з пастановай Рады Беларускага школьнага аддзела ад 17 верасня 1923 г. была створаная Цэнзавая камісія (С. Сахараў, К. Езавітаў, Стамкоўскі, М. Дзямідаў, П. Клявінь, Я. Шчорс), якая занялася разглядам спраў настаўнікаў, што не маглі прадставіць дакументальных доказаў педагагічнай адукацыі. Камісія выдавала часовыя пасведчанні пра допуск да працы настаўнікамі-практыкантамі пры ўмове, што яны вытрымаюць іспыт на настаўнікаў 1-й катэгорыі[562].

Педагогі "дарэвалюцыйнай школы" выкарыстоўвалі "старыя" метады працы з вучнямі, якія лічыліся недапушчальнымі ў латвійскіх школах. У сувязі

---

[558] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 47, л. 11; LVVA, 2125 f., 5 ap., 42 l., 117 lp.

[559] LVVA, 2125 f., 5 ap., 259 l. 17–24 lpp.

[560] LVVA, 2125 f., 5 ap., 35 l., 89 lp.

[561] LVVA, 2125 f., 5 ap., 230 l., 19–20 lpp.

[562] LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 100 lp.

з гэтым яны выклікалі крытыку беларускага школьнага кіраўніцтва. 26 красавіка 1922 г. кіраўніцтва Беларускага школьнага аддзела звяртала ўвагу інспектара на тое, што ў 1-й Прыдруйскай школе на жаданне бацькоў настаўнікі выкарыстоўвалі лінейку як сродак утрымання класнай дысцыпліны. Сяргей Сахараў лічыў гэту з'яву недапушчальнай, таму раіў інспектару правесці тлумачальную гутарку з настаўнікамі, каб давесці ім, што такія сродкі ганьбяць аўтарытэт настаўніка ў вачах іншых, асабліва латышоў як свабодалюбных і чулых на "ўсё тое, што паніжае паважанасць чалавека"[563].

У беларускіх школах працавалі педагогі розных нацыянальнасцей з перавагай беларусаў. Пры гэтым адсотак небеларусаў быў найбольш заўважны ў першыя два гады дзейнасці беларускіх школ. Восенню 1922 г. у школах Даўгаўпілшчыны і Лудзеншчыны працавалі 103 настаўнікі, з іх 82 было беларусамі, 10 латышамі, 6 рускімі і 5 палякамі. Прадстаўнікі двух апошніх нацыянальнасцей працавалі ў Рунданскай, Пылзенскай, Лудзенскай і Зілупскай школах Лудзенскага павета, а таксама ў Кокінскай і Лупандаўскай – Даўгаўпілскага павета[564]. Пераважна педагогі небеларускай нацыянальнасці выкладалі агульнаадукацыйныя прадметы, перадусім латышскую мову[565]. Беларускія школьныя ўлады імкнуліся паменшыць колькасць небеларусаў сярод педагогаў. Нягледзячы на гэта значная частка настаўнікаў беларускіх школ была небеларускай нацыянальнасці. У 1923/24 гг. у беларускіх пачатковых школах і камплектах працавала 88 настаўнікаў, сярод якіх беларусаў былі 61 (69,3%), латышоў – 16 (18,1%), рускіх – 7 (7,9%), палякі – 3 (3,4%) і латгалец – 1 (1,1%)[566]. Паводле іншых звестак нацыянальны склад настаўнікаў у гэты час быў наступны: беларусы – 62,3%, латышы – 18,4%, рускія – 11,5%, палякі – 3,8%, літоўцы і ўкраінцы – па 1,5%, немцы – 0,7%[567].

Прысутнасць сярод педагогаў значнай колькасці небеларусаў з'яўлялася адной з прычын таго, што ў школах не заўсёды гучала беларускае слова. Некаторыя настаўнікі-небеларусы не атаясамлівалі сябе з беларускімі нацыянальнымі патрэбамі. У справазадчы за 1921–22 гг. С. Сахараў канстатаваў, што амаль палову настаўнікаў беларускіх школ складалі небеларусы, частка з якіх знаходзіцца ў апазіцыі да беларускасці і патрабуе перадачы школ у падпарадкаванне Рускага школьнага аддзела[568]. 16 снежня 1922 г. БША прасіў кіраўніка Даўгаўпілскай беларускай гімназіі, каб ён дапамог у пошуках адпаведных кадраў[569].

---

[563] LVVA, 2125 f., 5 ap., 42 l., 25 lp.
[564] LVVA, 2125 f., 5 apr., 256 l., 27–28 lpp.
[565] LVVA, 2125 f., 5 ap., 35 l., 16 lp.
[566] LVVA, 2125 f., 5 ap., 259 l. 17–24 lpp.
[567] LVVA, 2125 f., 5 ap., 259 l., 17–24 lpp.
[568] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 110, л. 3–5.
[569] LVVA, 2125 f., 5 ap., 247 l., 129 lp.

У сувязі з гэтым не павінна здзіўляць, што на першым этапе існавання беларускіх школ у Латвіі частка настаўнікаў не ведала або слаба ведала беларускую літаратурную мову. Многія "старыя" настаўнікі, якія атрымалі прафесійную падрыхтоўку ў царскай Расіі, не заўсёды разумелі каштоўнасць беларускай нацыянальнай ідэі. З аналізу дакументацыі Беларускага школьнага аддзела вынікае, што некаторыя настаўнікі лічылі ўвядзенне беларускай мовы часовай з'явай[570]. У справаздачы з дзейнасці БША ў 1922/23 гг. чытаем: "*У некаторых беларускіх школах і дагэтуль пратрываюць працаваць элементы, благажадана настроеныя адносна беларускае школы. Гэтыя элементы дапамагаюць пераварачванню беларускае школы ці ў расейскія ці ў польскія. Так было ў Люцынскім пав. Напр. Вертулаўская школа, кіраўніца якой Лельмеж чамусьці неўзлюбіла беларускае школы, далей Рэстмуйжская, дзе кіраўнік Пятроў – шчыры супрацоўнік беларускае культурна-прасветнае працы, цяпер ужо перайшоў на другую пасаду і інш., тое-ж наглядалася і ў Дзвінскім павеце. У Кокінскай школцы кіраўніца Банікевіч перавярнула ўсіх беларусаў у палякаў, у Пустынскай школцы вучыцель Сухаржэўскі вёў кампанію на шкоду беларускае школы і г.п. (...) (...) Адсутнасць цвёрдай трывалаці сярод вучыцельства і нахіл яго некаторых сяброў у другі бок зрабілі тое, што ў бягучым годзе Беларускі Аддзел пазбавіўся часткі сваіх школ: у Люцынскім павеце тры школы – Ляўзінская, Дэглеўская і Палішчанская пераданы ў агульны Дэпартамент, а тры ў Расейскі Аддзел – Стара-Слабодская, Вертулаўская і Рэстмуйжская; у Дзвінскім павеце тры школы – Пустынская, І Прыдруйская і Ліўчанская перашлі ў агульны школьны Дэпартамент*" [571].

Вось якім чынам моўную сітуацыю ў Рунданскай і Стараслабадской школах узгадваў іх былы вучань Язэп Пушкоўскі: "*Спачатку мяне адправілі ў Рунданскую пачатковую школу, якая на першых парах была расейскай, но дзякуючы старанню нашых дзеячоў, была перароблена ў беларускую. Па якой прычыне ў гэтай школе не было ніводнага настаўніка-беларуса, не ведаю, так што, выйшла так, што школа мела толькі назву беларускай, а на самым дзеле ніхто не чуў сваёй мовы. К гэтаму часу памёр мой дзед і апекуном над мной абралі настаўніка гэтай самай школы, які быў латыш і мала інтэрасаваўся беларускай справай, хаця і быў тут кіраўніком. Па сканчэнні Рунданскай школы мяне адправілі ў Старую Слабаду, дзе якая ў той час і лічылася беларускай, но беларуская мова ізганялася. Рускі вучыцель, памятаю, не раз браніўся на мяне, што я, гутара па-расейску, устаўляў беларускія словы*"[572].

Інспектар К. Езавітаў бачыў непасрэдную сувязь паміж прысутнасцю ў школах настаўнікаў-небеларусаў і пераходам часткі школ у падпарадка-

[570] LVVA, 2125 f., 5 apr., 49 l., 12 lp.

[571] LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 67 lp.

[572] LVVA, 3175 f., 1 ap., 14 l., 65 lp.

ванне іншых нацыянальных аддзелаў – Рускага і Польскага. У прыватнасці, у адным са службовых рапартаў (11 верасня 1922 г.) ён адзначаў, што на Пустыншчыне і Прыдруйшчыне жаданне пакінуць Беларускі школьны аддзел выяўляюць тры школы: "*Прыдруйская, дзе вучыцелі Высокіх і Чыжэвіч падлежылі звальненню, як непедагогі, небеларусы, і, апрача таго, як не аказаўшыя ніякіх успехаў на курсах для практыкантаў; Пустынская, дзе вучыцелі Красневіч і Сухажэўскі падлежылі звальненню за тое, што, будучы практыкантамі, не з'явіліся слухаць курсаў для практыкантаў; Максімаўская, дзе працуе вучыцелька-полька Станкевіч, якая скончыла Сарбону ў Парыжы і страдает яўным нахілам да Польшчы (...) Зусім зразумела, што вучыцелі Пустынскай і Прыдруйскай школак павінны быць звольнены, бо іх варожая да беларускага нацыянальнага меншынства праца ўжо зусім ясна вызначылася*"[573]. Праз два дні дзеяч пісаў інспектару асноўных школ Ілукштанскага павета пра тое, што ў беларускія школы на Прыдруйшчыне і Пустыншчыне былі скіраваныя на працу настаўнікі, якія не праслухалі курсаў беларусазнаўства і не мелі нічога супольнага з беларускай справай (рускія і палякі)[574].

---

[573] LVVA, 2125 f., 5 ap., 39 l., lpp. 57–59.

[574] Варта прывесці гэты дакумент цалкам: "*Господину Инспектору Основных школ Иллукского района*

В ответе на предложение Ваше, сим имею честь изложить свое мнение по вопросу обследования школ Придруйской и Пустынской волостей.

К сожалению, не во все эти школы были назначены учителя-белоруссы, прослушавшие белорусския учительския курсы: в некаторых школах были назначены не только не прослушавшия белорусских курсов учителя-белоруссы, но даже лица, не имеющие никакого отношения к белорусской нации, – великороссы и поляки.

Эти две национальности в продолжении многих веков пытались, с двух сторон, ассимилировать белорусский народ и поэтому каждый интеллигент, воспитанный одной из этих наций, всегда стремился и стремится слить белоруссов со своей нациею. Ясно, что учителя-поляки стремились ополячить белоруссов, а учителя-великороссы – руссифицировать их, причем и те, и другие, конечно, старались привить и детям, и родителям белоруссам чувство стыда за свой 'мужицкий' язык и стремление усвоить язык соседей. Пропагадна эта, поддержанная на месте некоторыми родителями, происходящими из сословия так называемой 'шляхты', считающей себя поляками, имела особенный успех во тех школах, где не было ни единого учителя-белорусса из числа окончивших белорусские учительские курсы. Из таких школ поступили, наконец, заявления родителей, что они считают изучение белорусского языка для себя лишним. Заявления эти сделаны: 1) Придруйской 1 Школой, где заведующий школой, В. Высоких – великоросс, с ясновыраженным сибирско-уральским происхождением своей фамилии, 2-я учительница – Чижевич, считает себя полькой, 3-я учительница – Арень – латышка; 2) Пустынскай Школой, где заведующим учитель-практикант, Красневич, по происхождению белорусс, но белорусских курсов не прослушал, 2-й учитель, Сухаржевский, ясно своей национальной принадлежности не выявил, но белорусских курсов не слушал и ко всему белорусскому явно враждебен, причем нельзя сказать, чтобы не имел симпатии к другим национальностям, например, к полякам; 3) Максимовской Школой, расположенной в имении

Пры гэтым К. Езавітаў лічыў, што справу “беларусізацыі” беларускіх школ запавольвае Лудзенская павятовая школьная ўправа і мясцовы школьны інспектар, якія не жадалі звальняць настаўнікаў-небеларусаў і замяняць іх слухачамі курсаў беларусазнаўства і гадавых настаўніцкіх курсаў[575].

Здараліся сітуацыі, калі настаўнікі, якія лічылі сябе беларусамі, разумелі сваю беларускасць як частку расійскасці або акрэслівалі сваё паходжанне як “беларусы расійскай культуры”[576]. У зборах БША захоўваецца ліст Якава

Невляны, принадлежащем помещице-польке, Шадурской; здесь учительницей состоит весьма образованная девушка, окончившая в Париже Сарбону; слушать белорусских курсов она, конечно, не пожелала, но белорусским языком успела овладеть в достаточной степени и даже преподавала его в школе; однако сама она с безусловными симпатиями у Польше, да и все бывшие служащие имения (когда-то бывшие в нем крепостными-дворовыми) значительно ополячены предыдущею деятельностью нескольких поколений Шадурских, а потому и немудрено, что здесь, ярче, чем в каком-нибудь другом месте, при опросе сказалось тяготение к польскому языку и Польше.

Как же выйти из создавшегося положения.

Мне кажеться, что раз мы с безусловной несоменностью установили, что во всех этих местностях живет белорусское население и что, как сами они единодушно говорят и признают, все они дома говорят только по-белорусски, за исключением нескольких семейств ‘шляхты’, которые говорят на смешанном белорусско-польском диалекте, – то мы должны признать неабходимым:

1) школы эти оставить за Белорусским Отделом и считать белорусскими,

2) просьбы родителей о преподавании в этом году трех языков, – латышского, русского и польского, – удовлетворить, но только в этом году,

3) преподавательский состав этих школ заменить учителями белоруссами и латышами, дабы можно было неселение воспитывать в национальном духе и вместе с тем дать им хорошия познания в латышском языке и воспитать в уважении к Латвийской Государственности.

Что касаеться выраженного белорусским населением нежелания изучать родной язык за ненадобностью его (‘мы и так его хорошо знаем’), то я, безусловно, считаю эти заявления и мысли искусственно-привитыми.

Белорусское население страшно ополячено и руссифицировано, но только психологически, а не фактически, ибо оно не забыло национального язяка и говорит дома всегда и только на нем.

Чувство же стыда за свой язык – это такое-же искуственноо-привитое чувство, как чувство стыда за латышский язык, прививавшееся когда-то латышам в Риге немцами, бывшее одно время довольно сильным, а ныне – изчезнувшее безследно.

И я уверен, что население белорусское на местах, после занятий учителей, а возможно, что и гораздо раньше, ообсудивши и зввесивши всесторонне сделанные заявления, – безусловно возьмет их обратно и будет защищать свою национальную школу от всяческих покушений людей, враждебно настроенных к белоруссам.

К изложенному считаю необходимым, что самая компетентность родительских собраний, с которыми нам пришлось, в условиях спешки и без списочных проверок присутствующих, работь, не может считаться полной и безопелляционной и я предвижу с мест заявления протеста”. LVVA, 2125 f., 5 apr., 38 l., 457 lp.

[575] LVVA, 2125 f., 5 apr., 106 l., 11 lp.

[576] К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, Рыга 1927 [перадрук: Нью-Ёрк – Менск 2013], с. 80–81, 87–88.

Суслава, які звярнуўся да К. Езавітава з просьбай дапамагчы яму знайсці працу ў беларускай школе. Пры гэтым аўтар адзначаў, што ён ахвотна можа працаваць у беларускай школе, але на рускай мове[577]. Некаторыя педагогі мусілі прайсці нялёгкі шлях ментальнай трансфармацыі ад людзей, якія раней пагарджалі роднай культурай, да шчырых выхавальнікаў беларускай моладзі. Вось як апісвала свае ўражанні П. Мядзёлка-Грыб пасля першай сустрэчы з удзельнікамі месячных настаўніцкіх курсаў (1922 г.): "*А на ліха нам здаўся гэты ваш нейкі бе-ла-рус-кі язык? – загудзеў бас таго самага настаўніка з сівой барадой. – Нашто нам дзяцей калечыць гэтым нарэчыем? Гэта не язык, а мешаніна сапсаванага рускага языка з польскім*"[578]. Настаўнік Васіль Руднікаў (Руднінская школа) на пачатку 1923 г. пісаў К. Езавітаву, што беларуская школа будзе знаходзіцца пад пагрозай закрыцця да таго часу, пакуль у ёй не будуць працаваць нацыянальна свядомыя настаўнікі-беларусы. Самога В. Руднікава Лудзенская школьная ўправа адмовілася прызначыць настаўнікам у беларускую школу ў вёсцы Рудні (Істэрская воласць) нягледзячы на тое, што ён меў педагагічную падрыхтоўку і скончыў беларускія настаўніцкія курсы[579].

У 1922/23 гг. перад беларускім школьным кіраўніцтвам востра паўстала пытанне нястачы кваліфікаваных настаўніцкіх кадраў. Інспектар К. Езавітаў наступным чынам акрэсліваў асноўныя заданні кадравай палітыкі Беларускага школьнага аддзела: 1) падрыхтоўка новых настаўнікаў, 2) нацыянальная праца сярод старых настаўнікаў, якія ўжо працавалі ў беларускіх школах, 3) выдаленне з беларускіх школ настаўнікаў, якія непрыхільна і варожа ставіліся да беларускай справы[580].

У выніку размеркавання выпускнікоў першых курсаў беларусазнаўства, у 1922/1923 гг. у 75% беларускіх школ Даўгаўпілшчыны настаўнікамі былі беларусы, якія навучалі па-беларуску. Горш справа выглядала на Лудзеншчыне, дзе толькі 35–40% настаўнікаў складалі беларусы, а асноўнай мовай навучання па-ранейшаму была руская. БША лічыў, што віной з'яўляецца палітыка Лудзенскай павятовай школьнай управы, якая байкатавала прызначэнне новых настаўнікаў у беларускія школы[581]. Інспектар К. Езавітаў лічыў прысутнасць рускіх і рускамоўных настаўнікаў у беларускіх школах на Лудзеншчыне наступствам таго, што раней гэтыя школы былі рускімі. Дзеяч лічыў, што з цягам часу сітуацыя выправіцца, дзякуючы прыняццю на працу новападрыхтаваных педагогаў-беларусаў з ліку выхаванцаў беларускіх настаўніцкіх

---

577 LVVA, 2125 f., 5 apr., 256 l., 75 lp.

578 П. Мядзёлка, *Сцежкамі жыцця*, Менск 2018, с. 320.

579 LVVA, 2125 f., 5 apr., 200 l., 9 lp.

580 К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, Рыга 1927 [перадрук: Нью-Ёрк – Менск 2013, с. 99.

581 НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 108, л. 1–3; LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 37–38 lpp.

курсаў. Адсутнасць у Лудзы нацыянальна свядомага элементу ён лічыў аб'ектыўнай з'явай, паколькі – у адрозненне ад Даўгаўпілса – тут не было настаўніцкіх курсаў, а толькі ўлетку 1922 г. былі праведзеныя кароткачасовыя курсы беларусазнаўства пад кіраўніцтвам П. Мядзёлкі-Грыб[582].

Аднак падрыхтоўка новых кадраў патрабавала часу. Яшчэ адным шляхам пераадолець нястачу надзейных педагагічных кадраў быў пошук адпаведных кандыдатаў па-за межамі Латвіі. Гэта тлумачыць прысутнасць сярод настаўнікаў пэўнай колькасці іншаземцаў[583]. 24 красавіка 1922 г. інспектар К. Езавітаў заклікаў кіраўніцтва таварыства "Бацькаўшчына" шукаць падрыхтаваных настаўнікаў-беларусаў супольна з іншымі беларускімі культурна-асветнымі арганізацыямі за мяжой[584]. Ён і сам актыўна далучыўся да пошуку. Увесну 1922 г. дзеяч неаднаразова звяртаўся ў ТБШ у Вільні з просьбай знайсці настаўнікаў, ахвотных працаваць у Даўгаўпілскай беларускай гімназіі. На яго прапанову ў ліпені 1922 г. Рада БША пагадзілася запрасіць выкладчыкамі на настаўніцкія курсы Браніслава Тарашкевіча, Сымона Рак-Міхайлоўскага, Аркадзя Смоліча, Міколу Вяршыніна, Язэпа Варонку, Алеся Галавінскага і Клаўдзія Дуж-Душэўскага[585]. Нягледзячы на тое, што ніхто з іх не выказаў жадання прыехаць у Латвію, А. Смоліч і Б. Тарашкевіч рэкамендавалі запрасіць Максіма Гарэцкага і Івана Краскоўскага[586]. 13 жніўня 1922 г. К. Езавітаў інфармаваў С. Сахарава, што 15 верасня Язэп Варонка збіраецца выехаць з Коўна ў Даўгаўпілс[587]. Нягледзячы на тое, што дадзеная інфармацыя не пацвердзілася, на заклік К. Езавітава адгукнуліся іншыя беларускія дзеячы. З Вільні ў 1921 г. прыехалі Ігнат Дварчанін і Эдвард Будзька; з Коўна ў пачатку 1922 г. – Андрэй Якубецкі, Іван Краскоўскі, Максім Гарэцкі, Уладзімір Пігулеўскі; з Берліна ў ліпені 1922 г. – Паўліна Мядзёлка-Грыб; з Польшчы – у лістападзе 1922 г. Сяргей Казека і Мікалай Дзямідаў; з Літвы ў 1924 г. – Сцяпан Сіцько. Апошні перабраўся ў Латвію пасля таго, як былі расфарміраваныя беларускія аддзелы літоўскага войска. Сябры Віленскага БНК І. Краскоўскі і А. Якубецкі прыехалі з Літвы, дзе знайшлі часовы прытулак пасля дэпартацыі польскімі ўладамі з Вільні. Усе вышэйзгаданыя дзеячы актыўна ўключыліся ў грамадскую і школьную працу. Напрыклад, П. Мядзёлка-Грыб уладкавалася лектарам на гадавых настаўніцкіх курсах, а з восені 1922 г. – настаўніцай у Даўгаўпілскую беларускую гімназію[588].

---

[582] LVVA, 2125 f., 5 ap., 105 l., 20 lp.

[583] LVVA, 2125 f., 5 apr., 106 l., 3 lp.

[584] LVVA, 2125 f., 5 ap., 38 l., 65 lp.

[585] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 107, л. 48.

[586] А. Вабішчэвіч, *"Але ж шлях да свабоды старонка праложа!"* [у:] *Сыны і пасынкі Беларусі*, рэд. С. Барыс, Менск 1996, с. 325.

[587] LVVA, 2125 f., 5 ap., 42 l., lp. 173; LVVA, 2125 f., 5 ap., 247 l., 69 lp.

[588] К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, Рыга 1927 [перадрук: Нью-Ёрк – Менск 2013], с. 65–67.

Справа запрашэння замежных педагогаў не была простай. У адпаведнасці з бюракратычнымі працэдурамі, належала атрымаць ад латвійскіх улад дазвол на працу. Тым часам, не ўсе ахвотныя працаваць у Латвіі трымаліся належных працэдур. У адным з лістоў К. Езавітаў пісаў, што "*тут не Літва Сродкова і форма саблюдаецца свята, а нашы людзі, як бы яны ні казаліся знамяніты, тутака вельмі часта зусім невядомы*"[589]. Належыць адзначыць, што Міністэрства асветы Латвіі непрыхільным вокам глядзела на прыезд настаўнікаў з-за мяжы[590]. У верасні 1922 г. міністэрства звяртала ўвагу Беларускага школьнага аддзела на тое, што ён часта выклікае настаўнікаў – грамадзян Польшчы і іншых іншаземцаў, што з'яўляецца непажаданым. У прыватнасці, улады выказвалі скептыцызм у сувязі з прыездам С. Казекі. Праўда, у рэшце рэшт, 1 снежня 1922 г. Міністэрства асветы згадзілася на яго прыезд у Латвію[591].

На пачатку 1923 г. у беларускіх школах працавала 7 настаўнікаў-замежнікаў. Аднак па-ранейшаму адчувалася нястача кваліфікаваных і нацыянальна свядомых педагогаў. Беларускі школьны аддзел тлумачыў, што немагчыма за год-два падрыхтаваць высокакваліфікаваныя кадры для школ з ліку мясцовых кандыдатаў[592]. 25 кастрычніка 1923 г. Рада міністраў Латвіі адмовіла працягнуць дазвол на працу ў латвійскай сістэме адукацыі ў 1923/24 гг. замежнікам – настаўнікам Лудзенскай беларускай гімназіі С. Казеку, Р. Плыгаўку і Генрыку Пендзелю, а таксама катэхету Даўгаўпілскай беларускай гімназіі кс. Антонісу Шылінісу. Беларускі школьны аддзел лічыў рашэнне несправядлівым. У звароце да міністра адукацыі (1 лістапада 1923 г.) кіраўнік БША звярнуў увагу на тое, што настаўнікі С. Казека і Р. Плыгаўка з'яўляюцца незаменнымі спецыялістамі, якія навучаюць на беларускай мове, і ў выпадку іх выезду з Латвіі шэраг прадметаў будзе выкладацца па-руску. Тым часам, кандыдатуру трэцяга настаўніка Г. Пендзеля БША не лічыў патрэбным падтрымаць, бо ён не быў беларусам[593].

У наступныя месяцы беларускі актыў працягваў шукаць педагогаў па-за межамі краіны. У снежні 1923 г. К. Езавітаў звярнуўся да наркама асветы БССР Усевалада Ігнатоўскага з просьбай дэлегаваць у Латвію беларускіх педагогаў. Адказ Менска быў адмоўны, паколькі ў БССР існавала запатрабаванасць на настаўнікаў у сувязі з планаваным узбуйненнем тэрыторыі Савецкай Беларусі[594].

---

[589] LVVA, 2125 f., 5 apr., 38 l., 41 lp.

[590] LVVA, f. 2125, 5 apr., 374 l., 31 lp.

[591] К. Казачёнок, *"Белорусский процесс" в Латвии: обвинение, оправдание, наказание*, "Латыши и беларусы: вместе сквозь века. Сборник научных статей", ред. М.Г. Королёв, Минск 2012, с. 39.

[592] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 43, л. 12.

[593] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 43, л. 23.

[594] *Беларускі Працэс у Латвіі*, Рыга 1926, с. 16.

У 1923/24 гг. у беларускіх школах працавала ўжо 14 настаўнікаў-іншаземцаў, сярод якіх 4 (І. Краскоўскі, П. Мядзёлка-Грыб, А. Якубецкі і П. Жэрдзі) былі дапушчаныя да педагагічнай дзейнасці ў Латвіі згодна з рашэннем Кабінета міністраў, а астатнія 10 – на падставе дазволу міністра асветы. 25 ліпеня 1924 г. рашэннем БША пяцёра іншаземцаў былі звольненыя з працы. Астатнія дзевяць (С. Казека, Аўгуст Дварэцкі, С. Сіцько, І. Краскоўскі, П. Мядзёлка-Грыб, А. Якубецкі, П. Жэрдзі, Феадосія Яленеўская, А. Якубецкая) былі прызнаныя патрэбнымі ў беларускіх школах, таму Рада БША 26 ліпеня 1924 г. прасіла міністра асветы дазволіць ім працягнуць працу[595]. На выпадак іх звальнення Беларускі школьны аддзел падрыхтаваў спіс іншых кандыдатаў[596].

Адначасова з запрашэннем на працу іншаземцаў, рабіліся захады, каб пазбыцца "ненадзейных" педагогаў. У чэрвені 1922 г. К. Езавітаў звяртаў увагу кіраўніцтва БША на неабходнасць замены гэтых людзей настаўнікамі з ліку нацыянальна свядомых беларусаў. Ён лічыў, што замена павінна адбыцца як мага хутчэй, але не балюча, каб "*не вызваць ні ломкі школы, ні незадаволенасці вучыцельства, ні выкідання на вуліцу небеларускіх элементаў*"[597]. З гэтай мэтай дзеяч прапаноўваў: 1) правесці рэгістрацыю ўсіх настаўнікаў-беларусаў; 2) абавязаць усіх настаўнікаў, незалежна ад нацыянальнасці, якія працуюць у беларускіх школах або хочуць там працаваць, праслухаць курсы беларусаведы; 3) перавесці ў іншыя школы ўсіх настаўнікаў, якія не пажадалі наведваць курсы беларусаведы; 4) спыніць прыймо ў беларускія школы настаўнікаў, якія не праслухалі курсаў; 5) патрабаваць ад міністра асветы, каб на новыя вакансіі ў беларускія школы прызначаліся тыя, хто праслухаў курсы. Беларускі дзеяч лічыў, што гэтыя змены трэба правесці да восені 1922 г., каб беларускія школы ўвайшлі ў новы навучальны год у лепшым складзе[598].

Каб рэалізаваць вышэйзгаданыя пастулаты, Рада БША 15 ліпеня 1922 г. вырашыла стварыць гурток для настаўнікаў-беларусаў пры таварыстве "Бацькаўшчына"; абавязаць усіх настаўнікаў праслухаць курсы беларусаведы; распрацаваць план як мага хутчэйшай беларусізацыі школы; паклапаціцца, каб у першым навучальным годзе ў кожнай школе быў настаўнік, які б выкладаў беларускую мову і беларусазнаўства; паведаміць усім павятовым школьным управам пра тое, што ў беларускіх школах могуць працаваць толькі настаўнікі, зацверджаныя аддзелам; накіроўваць на працу ў школы выпускнікоў настаўніцкіх курсаў, сярод якіх шмат "свядомых і вельмі здольных працаўнікоў"[599]. 17 жніўня 1922 г. К. Езавітаў падаў Беларускаму школьнаму

[595] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 26 lp.

[596] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 26 lp.

[597] LVVA, 2125 f., 5 apr., 42 l., 75 lp.

[598] LVVA, 2125 f., 5 apr., 42 l., 75–76 lpp.

[599] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 107, л. 47; LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 1–5 lpp., 32; LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 2 lp.

аддзелу спіс з сямі практыкантаў, якіх належала звольніць, бо яны не жадалі праслухаць курсы. Кіраўніцтва БША задаволіла гэтую просьбу[600]. На іх месцы прызначаліся новыя педагогі. Напрыклад, 24 лістапада 1922 г. БША прасіў Лудзенскую школьную ўправу зацвердзіць на пасаду настаўніка ў Зілупскую школу асобу з веданнем беларускай мовы[601].

21 красавіка 1923 г. на прапанову К. Езавітава Рада Беларускага школьнага аддзела вырашыла паскорыць замену нелаяльных да беларускай мовы і культуры настаўнікаў. Пастанавілі звярнуцца да міністра асветы з просьбай аб звальненні ў адміністратыўным парадку "вучыцялёў, нядображаданых з нацыянальнага боку". Беларускі актыў планаваў, што ў першай палове 1923/24 гг. усе настаўнікі праслухаюць курсы беларусазнаўства[602]. У дакуменце чытаем: "*Даручыць кіраўніку Беларускага Аддзела звярнуцца да Міністра Асветы з дакладам аб патрэбнасці змены вучыцялёў нядображаданых з нацыянальнага боку і з просьбай аб правядзенні ў жыццё гэтых зменаў шляхам адміністрацыйным, без чаго будзе цяжка прывесці ў жыццё поўны пераход выкладання беларускай мовы*"[603].

За гэтымі дэкларацыямі ішлі дзеянні. Беларускі школьны аддзел накіроўваў просьбы ў павятовыя школьныя ўправы ў Даўгаўпілсе і Лудзы пра замену настаўнікаў-небеларусаў на беларусаў. У красавіку 1923 г. кіраўнік Шнекаўскай школы М. Талерка звяртаў увагу БША на паводзіны настаўніцы Мільды Клейсберг, якая "выкладанне лекцыяў вядзе па-расейску і ўвесь час падсмеіваясь над родным пры дзецях"[604]. У выніку кіраўнік Беларускага аддзела 14 красавіка 1923 г. запатрабаваў ад Даўгаўпілскай школьнай управы звальнення настаўніцы з беларускай школы[605]. 16 жніўня 1923 г. кіраўніцтва БША прасіла Даўгаўпілскую павятовую школьную ўправу адклікаць двух настаўнікаў-рускіх Рэстмуйжскай школы, якім чужая была беларуская мова і культура, і замяніць іх настаўнікам-беларусаў і настаўнікам-латышом[606].

Не заўсёды, аднак, павятовыя органы задавальнялі просьбы БША. У такіх сітуацыях С. Сахараў быў вымушаны звяртацца непасрэдна ў Міністэрства асветы. Напрыклад, 9 траўня 1923 г. Беларускі школьны аддзел скіраваў ліст міністру асветы, у якім прасіў выдаць у адміністратыўным парадку загад павятовым школьным управам і інспектарам асноўных школ Латгаліі, каб настаўнікі беларускіх асноўных школ, якія да 15 чэрвеня не атрымаюць ад

---

[600] LVVA, 2125 f., 5 apr., 42 l., 158 lp.

[601] LVVA, 2125 f., 5 ap., 232 l., 19 lp.

[602] LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 80 lp.; LVVA, 2125 f., 5 apr., 4 l., 6–14 lpp.

[603] LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 78–79 lpp.

[604] LVVA, 2125 f., 5 ap., 213 l., 7 lp.

[605] LVVA, 2125 f., 5 ap., 212 l., 13 lp.

[606] LVVA, 2125 f., 5 ap., 40 l., 4 lp.

БША педагагічнай рэкамендацыі, пазбаўляліся працы ў беларускіх школах. У дакуменце падкрэслівалася, што рэкамендацыя будзе выдавацца толькі настаўнікам, якія ведаюць беларускую мову і згодныя на ёй весці заняткі[607]. 3 ліпеня 1923 г. Міністэрства асветы выдала распараджэнне, згодна з якім у беларускіх школах маглі працаваць толькі настаўнікі, якія маюць пасведчанні кіраўніцтва Беларускага школьнага аддзела. Такі дакумент настаўнікі павінны былі атрымаць да 15 жніўня[608].

На месцах, аднак, гэты загад не заўсёды выконваўся. 13 жніўня 1923 г. С. Сахараў накіраваў ліст Даўгаўпілскай і Лудзенскай павятовым школьным управам, у якім нагадваў, што настаўнікамі ў беларускіх школах могуць быць толькі педагогі з пасведчаннямі БША. Не тычылася гэта адно настаўнікаў латышскай мовы[609]. Ёсць, аднак, падставы меркаваць, што на Лудзеншчыне ў беларускія школы на працу па-ранейшаму прымалі неадпаведных асоб. Такім чынам Лудзенская павятовая школьная ўправа ігнаравала кадравую палітыку БША. Сведчыць пра гэта наступны прыклад. 18 жніўня 1923 г. Беларускі школьны аддзел накіраваў у распараджэнне Лудзенскай школьнай управы настаўніц Пелагею Клюшкову і Сафію Кудраўцову, якія праслухалі беларускія настаўніцкія курсы. Аднак гэтыя настаўнікі не атрымалі згоды на працу. У выніку 25 кастрычніка 1923 г. БША апратэставаў дзеянні Лудзенскай павятовай школьнай управы і звярнуўся да міністра асветы з просьбай вырашыць пытанне[610]. 9 студзеня 1924 г. К. Езавітаў звярнуўся з лістам да школьнага інспектара Ілукштанскага павета з просьбай перавесці Ядвігу Станкевіч з Няўлянскай беларускай школы ў польскую або рускую. У якасці прычыны ён называў тое, што настаўніца была полькай і атрымала рэкамендацыю на педагагічную працу з Польскага школьнага аддзела[611].

13 чэрвеня 1924 г. Беларускі школьны аддзел зноў прасіў міністра асветы выдаць распараджэнне павятовым школьным управам і інспектарам асноўных школ, каб яны прызначалі і адклікалі настаўнікаў у беларускіх школах па ўзгадненні з БША[612]. 25 ліпеня 1924 г. на пасяджэнні Рады аддзела было вырашана хадайнічаць перад кіраўніком Агульнага школьнага дэпартамента пра дазвол не даваць рэкамендацый на працу настаўнікам, якія не скончылі курсаў беларусазнаўства[613]. 12 жніўня 1924 г. Беларускі школьны аддзел прасіў кіраўніцтва Агульнага школьнага

---

[607] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 43, л. 14–15.
[608] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 48, л. 18.
[609] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 45, л. 22.
[610] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 43, л. 22.
[611] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 46, л. 6.
[612] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 44, л. 9.
[613] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 45, л. 5.

дэпартамента звольніць з беларускіх школ двух настаўнікаў як "непажаданых для беларускай школы"[614].

Варта аднак падкрэсліць, што сярод настаўнікаў-небеларусаў былі людзі, якія шчыра спачувалі беларускай справе і актыўна працавалі. Прыкладам можа быць руская Алена Дзямідава, якая спачатку кепска ведала беларускую мову, таму ліставалася з К. Езавітавым па-руску. Адначасова жанчына прасіла даслаць ёй беларускія выданні. У адным з лістоў яны пісала: "*Никогда не думала, что здесь действительно живут настоящие белоруссы*"[615]. Прыкладам добрага настаўніка быў праваслаўны латыш Пётр Клявінь, які кіраваў Рунданскай школай. Інспектар К. Езавітаў характарызаваў яго як здольнага педагога і арганізатара[616].

У першыя гады існавання беларускіх школ у Латвіі многія педагогі не ведалі або кепска ведалі дзяржаўную мовуй[617]. Гэта стварала сур'ёзныя праблемы ў рэалізацыі навучальнай праграмы, бо некаторыя прадметы належала выкладаць па-латышску. У прыватнасці, згодна з распараджэннем міністра асветы ад 16 снежня 1922 г., у школах для нацыянальных меншасцей прадметы "Гісторыя Латвіі" і "Геаграфія Латвіі" вывучаліся па-латышску. У сувязі з гэтым 13 студзеня 1923 г. кіраўнік БША выдаў цыркуляр да кіраўнікоў беларускіх пачатковых і сярэдніх школ, каб яны з 1 лютага прыступілі да выканання міністэрскага загаду[618]. У адказ 24 студзеня 1923 г. школьная рада Зілупскай школы паведамляла, што выкладаць згаданыя прадметы па-латышску ў бягучым годзе немагчыма, паколькі ў выніку кепскай моўнай падрыхтоўкі мясцовай настаўніцы вучні не валодалі належным чынам дзяржаўнай мовай[619]. Праблему можна было вырашыць шляхам арганізацыі моўных курсаў, якія ладзіліся б рэгулярна і мелі абавязковы характар[620]. Згодна з патрабаваннямі міністэрства асветы, усе кіраўнікі школ мусілі здаць іспыт па латышскай мове да пачатку 1924/25 г., а настаўнікі – не пазней 1926 года[621]. Аднак слабае веданне дзяржаўнай мовы працягвала быць праблемай настаўнікаў беларускіх школ. 19 лістапада 1924 г. Беларускі школьны аддзел звярнуўся да беларускага настаўніцтва з заклікам "*звярнуць асаблівую ўвагу на выкладанне лытышскае мовы, гісторыі і геаграфіі Латвіі ў беларускіх школах, бо гэта вымагае жыццёвае становішча беларускае школы ў Латвіі*"[622].

---

[614] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 45, л. 6.
[615] LVVA, 2125 f., 5 apr., 207 l., 2 lp.
[616] LVVA, 2125 f., 5 apr., 207 l., 2 lp.
[617] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 48, л. 14.
[618] LVVA, 2125 f., 5 ap., 374 l., 11 lp.
[619] LVVA, 2125 f., 5 ap., 232 l., 32 lp.
[620] LVVA, 2067 f., 1 ap., 367 l., 31 lp.
[621] LVVA, 2125 f., 5 ap., 72 l., 16 lp.
[622] LVVA, 2125 f., 5 ap., 72 l., 29 lp.

Да абавязкаў настаўнікаў належала не толькі дыдактычная праца. Педагогі мусілі ўдзельнічаць у настаўніцкіх канферэнцыях. Яны склікаліся штогадова дзеля абмеркавання галоўных пытанняў школьнай справы. У прыватнасці, на канферэнцыях абіраліся прадстаўнікі настаўніцтва ў Раду БША. Захаваліся архіўныя крыніцы, якія дазваляюць падрабязна прасачыць працу канферэнцый. Першая беларуская настаўніцкая канферэнцыя адбылася 28–30 снежня 1922 г. у Даўгаўпілсе. У ёй узялі ўдзел 43 педагогі. Галоўная ўпраўленне Латвійскай чыгункі ўвяло 50% зніжкі на квіткі ўдзельнікам, паколькі большасць настаўнікаў прыехала ў Даўгаўпілс з правінцыі – з Індры, Краславы, Зілупе і Лудзы[623]. Падчас мерапрыемства быў агучаны шэраг дакладаў: І. Краскоўскага – *Тыпы беларускае народнае школы* і *Агульны агляд гістарычнае долі беларускага народа*, А. Якубецкага – *Праграмы беларускіх школ і значэнне роднае мовы ў школе*, П. Мядзёлка-Грыб – *Характар беларускай літаратуры*[624]. Прысутныя падсумавалі вынікі працы на ніве стварэння беларускіх школ у Латвіі. Праз невялікую колькасць удзельнікаў было вырашана назваць мерапрыемства не канферэнцыяй, а нарадай[625]. Настаўнікі, якія не з'явіліся на з'езд, атрымалі ад кіраўніка БША вымову, у якой адзначалася, што "*ўсе вучашчыя павінны прымаць актыўны ўдзел у будаванні беларускае школы, асабліва ў перыяд яе арганізацыі*"[626].

Другая беларуская настаўніцкая канферэнцыя адбылася 10–12 жніўня 1923 г. у Даўгаўпілсе. У мерапрыемстве ўзяло ўдзел 75 настаўнікаў, а старшынём быў абраны К. Езавітаў. Мерапрыемства наведалі госці – міністр асветы Латвіі Станіслаўс Яўдземс (*Staņislavs Jaudzems*), загадчык аддзела асноўных школ, школьныя інспектары Даўгаўпілскага і Ілукштанскага паветаў. На канферэнцыі быў прыняты шэраг ухвалаў, у тым ліку пра: выданне педагагічнага часопіса, стварэнне Беларускага культурнага фонда, патрэбу вядзення школьных летапісаў, стварэнне Беларускага этнаграфічнага музея ў Латвіі, вывучэнне моўных асаблівасцей беларусаў Латгаліі і складанне моўнага слоўніка[627]. Прысутныя прынялі рэзалюцыю наконт удзелу педагогаў у курсах беларусазнаўства[628]. Удзельнікі аптымістычна ацэньвалі перспектывы

---

[623] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 47, л. 23; LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 40 lp.

[624] LVVA, 2125 f., 5 ap., 19 l., 4 lp.

[625] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 47, л. 23; LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 40 lp.

[626] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 34 lp.

[627] *З Латвіі*, "Крывіч" 1923, № 3, с. 62.

[628] У дакумеце чытаем: "*З поваду вялікай перагружанасці вучыцялёў курсантаў, якія адначасна слухалі і курсы дзяржаўнай мовы, і курсы педагагічных прадметаў, і курсы фізічнага выхавання, прасіць Беларускі аддзел, каб ён: 1) усіх паўнапраўных вучыцялёў беларусаў зусім ад экзаменаў і зачотаў па беларусазнаўстве і педагагічных прадметах; 2) для вучыцялёў небеларускай нацыянальнасці апрацаваць праграму па беларусазнаўстве і прапанаваць ім падгатовіцца па ўказаных прадметах і вытрымаць іспыт к пачатку 1926 года; 3) для паўнапраўных вучыцялёў*

развіцця беларускай школы ў Латвіі. У рэзалюцыі канферэнцыі чытаем: "*нягледзячы на тое змаганне з беларускімі школамі, якое вядуць элементы варожыя беларускаму нацыянальнаму адраджэнню, школа беларуская штогод паступова ўзмацняецца; Беларускае сялянства, у працягу многіх гадоў зусім русіфікаванае і спаланізаванае пануючымі класамі, яшчэ дужа несвядома і часам саромееца сваёй нацыянальнасці; а таму вучыцельства беларускае школы павінна само быць нацыянальна свядомым, не павінна абмяжоўвацца працай толькі ў школе, а працаваць і над вняшкольнай прасветай і нацыянальным усведамленнем беларускага жыхарства ў Латвіі*"[629].

Настаўніцтва брала ўдзел у абмеркаванні пытанняў, звязаных з навучальным працэсам, і спосабамі яго ўдасканалення. Напрыклад, на пачатку 1923 г., на хвалі дыскусіі пра рэформу сярэдняй асветы, кіраўніцтва БША даслала кіраўнікам беларускіх школ ліст з прапановай педагагічным радам абмеркаваць дадзенае пытанне, каб зрабіць сярэднія школы "на больш жыццёвых і практычных пачатках"[630].

Беларускае настаўніцтва мела права дэлегаваць прадстаўніка ў склад гарадскіх і павятовых школьных рад. Архіў Беларускага школьнага аддзела дазваляе падрабязна прасачыць склад дэлегатаў. Напрыклад, у Даўгаўпілскай гарадской школьнай управе беларускіх настаўнікаў прадстаўляў Ян Шчорс, потым Уладзімір Корці. У верасні 1923 г. кіраўніцтва БША прасіла, каб інтарэсы беларускага настаўніцтва прадстаўляў У. Пігулеўскі, але апошні адмовіўся, спасылаючыся на тое, што без яго ведама раней гэта функцыя была даручаная Я. Шчорсу. Ён тлумачыў, што, не ведаючы дзейнасці Я. Шчорса, не хоча браць на сябе адказнасці за вынікі яго працы[631]. У 1924 г. беларускае настаўніцтва ў Даўгаўпілскай павятовай школьнай радзе прадстаўляў Уладзімір Дубовік[632]. Тым часам правы беларускага настаўніцтва ў Лудзенскай павятовай школьнай управе абараняў П. Клявінь[633].

зрабіць зачоты і іспыты ў бягучым годзе ў асобнай камісіі; 4) усім вучыцялям курсантам, слухаўшым летнія курсы беларусазнаўства і непрапусціўшым 1/3 лекцыяў, выдаць пасведчанне аб слуханні курсаў па прыкладу латышскіх курсаў. Вучыцеля беларусы, якія не былі на беларускіх вучыцельскіх аднагадовых курсах, і тыя, што праслухалі летнія вучыцельскія курсы ў 1921, 1922, 1923 годзе павінны самастойна ўглубіць сваё пазнанне па беларускай мове, літаратуры, гісторыі і іншых галінах беларускай культуры, каб заўсёды і запраўды быць нацыянальна свядомымі, карыстацца належным аўтарытэтам у школе і сярод беларускага сялянства, а таксама прынімаць энергічны ўдзел у развіцці нацыянальнай культуры". НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 107, л. 48.

[629] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 113, л. 1.

[630] LVVA, 2125 f., 5 apr., 374 l., 15 lp.

[631] LVVA, 2125 f., 5 ap., 176 l., 113 lp.

[632] LVVA, 2125 f., 5 apr., 8 l., 12 lp.

[633] LVVA, 2125 f., 5 ap., 40 l., 13, 15–19 lpp.

З цягам часу сярод беларускага актыву саспела думка аб стварэнні арганізацыі беларускіх настаўнікаў. Упершыню пытанне было ўзнята падчас першай беларускай настаўніцкай канферэнцыі (снежань 1922 г.), удзельнікі якой прапанавалі таксама разгледзець пытанне арганізацыі "агульнабацькоўскага школьнага хаўрусу"[634]. Працягам справы была ўхвала Рады БША ад 22 красавіка 1923 г., згодна з якой настаўнікам К. Езавітаву (у Лудзы) і У. Корці (у Даўгаўпілсе) даручалася стварыць беларускія секцыі пры Латвійскім настаўніцкім хаўрусе[635]. Падчас другой беларускай настаўніцкай канферэнцыі (жнівень 1923 г.) была прынятая ўхвала, у якой адзначалася, што "*арганізацыю беларускага вучыцельства на нацыянальным грунце [належыць] прызнаць пажаданай*"[636]. Адначасова была створаная камісія па распрацоўцы статута Хаўруса беларускага настаўніцтва ў Латвіі, у склад якой увайшлі: С. Сахараў, К. Езавітаў, М. Дзямідаў, Р. Плыгаўка, Я. Шчорс і А. Хруцкі[637]. Услед за гэтым 23 кастрычніка 1923 г. кіраўніцтва БША выдала цыркуляр да беларускага настаўніцтва, у якім адзначалася: "*Беларускае вучыцельства згодна пастановы кангрэсу заклікаецца згуртавацца наўкол нацыянальнага беларускага вучыцельскага хаўрусу дзеля абароны сваіх культурных і правовых інтарэсаў: устаў хаўрусу ўжо апрацаваны і будзе пасля зацверджаны належнымі ўстановамі разасланы па ўсіх беларускіх школах, пакуль жа што Беларускае Упраўленне просіць вучыцельства высылаць уступныя і членскія ўзносы (кангрэсам уступны ўзнос азначан у суме 50 рубл. і штомесячны 25 рубл.)*"[638].

У снежні 1923 г. С. Сахараў заклікаў настаўнікаў дасылаць заявы на ўступленне ў хаўрус, а таксама інфармаваў, што сябрамі арганізацыі могуць быць настаўнікі-небеларусы. У латгальскай правінцыі пачаўся збор складак на карысць новай арганізацыі. На Лудзеншчыне гэтым займаўся кіраўнік Лудзенскай школы Рыгор Плыгаўка, а на Даўгаўпілшчыне – кіраўнік Жакалеўскай школы Эдвард Вайводзіш[639]. Ахвотныя далучыцца да хаўрусу павінны былі заплаціць уступную (50 сантымаў) і месячную (25 сантымаў) складкі, за што адказваў скарбнік Я. Шчорс[640]. Ідэю стварэння хаўрусу падтрымалі ўдзельнікі настаўніцкага схода, які адбыўся 22 снежня 1923 г. у Даўгаўпілсе. Праўда, у рэзалюцыі адзначалася, што сябрамі новай арганізацыі могуць быць толькі нацыянальна свядомыя педагогі. У дакуменце

---

634 LVVA, 2125 f., 5 ap., 19 l., 4 lp.

635 LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 76 lp.

636 НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 113, л. 1.

637 *З Латвіі,* "Крывіч" 1923, № 3, с. 62.

638 НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 48, л. 26.

639 НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 48, л. 36.

640 LVVA, 6845 f., 2 ap., 4 l., 88 lp.

чытаем: "'*Беларускі нацыянальны вучыцельскі саюз у Латвіі', у склад якога могуць увайсці выключна тыя беларускія вучыцеля ў Латвіі, нацыянальна свядомыя, якія не толькі ідэёва, але і працай праводзяць у жыццё ідэалы беларускага нацыянальнага культурнага адраджэння*"[641]. Нягледзячы на шматбяцальны пачатак, справа стварэння прафесійнай арганізацыі беларускага настаўніцтва не мела хуткага фіналу[642]. З карэспандэнцыі паміж Беларускім школьным аддзелам і кіраўнікамі школ вынікае, што ўвесну 1924 г. беларускі настаўніцкі хаўрус не арганізаваўся[643]. Можна меркаваць, што адной з прычын былі непаразуменні сярод мясцовага беларускага актыву, які амаль цалкам складаўся з настаўнікаў.

Беларускае школьнае кіраўніцтва намагалася матываваць настаўнікаў да працы з дапамогай узнагарод і пахвалаў. Так, 7 траўня 1925 г. у Рызе адбыўся агульны сход прадстаўнікоў таварыстваў "Беларуская хата" і "Рунь", на якім было вырашана восенню, напярэдадні новага навучальнага года адсвяткаваць юбілей усіх беларускіх настаўнікаў, якія маюць не менш як 25 гадоў педагагічнай працы. З гэтай мэтай была створаная камісія (сакратар Н. Пінская) па падрыхтоўцы да святкавання, а К. Езавітаву, як яе старшыні, даручана ўвайсці ў зносіны з настаўніцтвам, юбілярамі і сабраць адпаведныя сродкі на мерапрыемства. Паводле задумы арганізатараў, святкаванне мусіла набыць характар агульнабеларускага культурнага свята ў Латвіі[644].

Вучні. У першыя гады існавання беларускіх пачатковых школ у Латвіі лічба вучняў вагалася ад 2,3 да 3,5 тыс. Колькасць змянялася пад уплывам змены лічбы беларускіх школ. Больш дакладна гэтыя змены можна прасачыць на падставе інфармацыі, якую ўтрымлівае табліца.

Табліца 23. Колькасць вучняў у беларускіх пачатковых школах у 1921–1925 гг.

Навучальны год	Даўгаўпілскі павет	Лудзенскі павет	Даўгаўпілс	Лудза	Краслава	Рыга	Разам
1921/22	1 223	2 187	-	103	-	-	3 513
1922/23	946	1 983	142	140	67	-	3 278
1923/24	861	1 586	128	132	44	150	2 901
1924/25	834	1 169	114	103	0	170	2 390

Уласнае апрацаванне на падставе: LVVA, 2125 f., 5 ap., 333 l., 58 lp.

641 НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 113, л. 3.

642 *Статут Таварыства беларускіх вучыцялёў у Латвіі*, Рыга 1927, с. 4.

643 LVVA, 6845 f., 2 ap., 4 l., 96 lp.

644 НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 94, л. 1; LVVA, 1826 f., 1 ap., 1004 l., 220 lp.

Згодна з заканадаўствам, у беларускіх школах маглі навучацца толькі вучні беларускай нацыянальнасці. У сувязі з гэтым 22 красавіка 1923 г. Рада Беларускага школьнага аддзела загадала кіраўнікам школ "*прынцыпова высцерагацца прыняцця ў беларускія сярэднія школы вучняў другіх нацыянальнасцяў, а асабліва латышоў*"[645]. Але толькі нешматлікія школы характарызаваліся аднародным нацыянальным складам[646]. У рэчаіснасці беларускія школы наведвалі прадстаўнікі розных нацыянальнасцей. Асобнай праблемай было вызначэнне нацыянальнасці вучняў ва ўмовах нізкай самасвядомасці латгальскага сялянства. Напрыклад, у снежні 1923 г. кіраўнік Зілупскай школы Аляксандр Еўдакімаў інфармаваў БША, што ён вызначае нацыянальнасць вучняў на падставе сведчанняў бацькоў. На яго думку, апошнія, не жадаючы запісваць сябе беларусамі, называюць сябе ў пашпартах латгальцамі, а па духу і мове з'яўляюцца рускімі. У сувязі з гэтым настаўнік прасіў не прымушаць яго перапраўляць звесткі наконт нацыянальнага складу, бо гэта толькі ўскладняе школьнае жыццё. Аднак БША ставіў пад сумнеў меркаванне настаўніка сцвярджаючы, напрыклад, што каталікі наўрад ці лічаць сябе рускімі. Паводле звестак БША, 80% вучняў школы былі беларусамі[647].

Аналіз даступных крыніц дае ўяўленне пра нацыянальны склад вучняў. Так, у 1921/22 гг. у беларускіх пачатковых школах навучалася 3 513 вучняў (1 223 на Даўгаўпілшчыне і 2 290 на Лудзеншчыне). Сярод іх беларусы складалі 3 093 (88%), у тым ліку ў Даўгаўпілскім павеце – 1 100 (89,9%%) і ў Лудзенскім – 1 993 (87%)[648]. Паводле няпоўных звестак, на пачатку 1922/23 гг. у беларускіх школах навучаліся 2 342 беларусы, 321 рускі, 127 латышоў, 73 палякі, 23 габрэі, 20 літоўцаў, 2 немцы і 21 прадстаўнік іншых нацыянальнасцей[649]. Існуюць звесткі наконт асобных школ, якія вылучаліся нацыянальнай стракатасцю. Напрыклад, у Шушкаўскай 4-гадовай школе (Лудзенскі павет) у 1921/22 г. налічвалася 189 вучняў, сярод іх было 163 беларусы і 26 латышоў[650]. У кастрычніку 1922 г. кіраўнік Краслаўскай школы інфармаваў, што ў яго школу запісалася 47 вучняў, у тым ліку 33 беларусы, 13 габрэяў і 1 рускі[651]. Тым часам, у Залескай школе ў 1923/24 гг. навучалася 99 беларусаў (82 каталікі

---

[645] LVVA, 2125 f., 5 apr., 374 l., 30 lp.

[646] Напрыкладу, у 1922 г. у Даўгаўпілскую школу было прынята 68 вучняў, сярод якіх усе былі запісаныя беларусамі. LVVA, 2125 f., 5 ap., 35 l., 25–27 lpp.

[647] На дакументе бачна рэзалюцыя кіраўніка БША: "*Пакуль кіраўніком школы і вучыцелямі ня будуць беларусы – да тых пор Зілупская бел. школа ня будзе беларускай. З думкамі Шк. Рады нельга згадзіцца*". LVVA, 2125 f., 5 ap., 232 l., 85 lp.

[648] Уласны падлік на падставе: К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, Рыга 1927 [перадрук: Нью-Ёрк – Менск 2013, с. 73–79.

[649] LVVA, 2125 f., 5 ap., 15l., 15 lp.

[650] LVVA, 2125 f., 5 apr., 214 l., 11 lp.

[651] LVVA, 2125 f., 5 ap., 146 l., 2 lp.

і 17 праваслаўных), 4 рускія, 3 літоўцы і 1 паляк[652]. Падрабязныя звесткі адносна нацыянальнасці вучняў захаваліся ў дачыненні да Рунданскай школы, што ілюструе дадзеная табліца.

Табліца 24. Нацыянальны склад Рунданскай школы ў 1922/23 гг.

Класы	Беларусы	Латышы	Рускія	Габрэі	Разам
Падрыхтоўчы	17	0	5	0	22
I	3	1	5	0	9
II	7	0	3	0	10
III	9	0	0	1	10
IV	4	0	3	0	7
Разам	40	1	16	1	58

Крыніца: LVVA, 2125 f., 5 ap., 207 l., 34 lp.

Прысутнасць небеларусаў сярод вучняў беларускіх школ нярэдка была прычынай непаразуменняў. 7 верасня 1923 г. адбылося пасяджэнне Даўгаўпілскай гарадской школьнай управы, на якім абмяркоўвалі пратэст дэпутата рускай меншасці ў латвійскім Сойме Мялеція Калістратава ў сувязі з тым, што ў Даўгаўпілскую беларускую пачатковую школу прымалі рускіх стараверaў. З абвінавачаннем быў нязгодны кіраўнік школы А. Якубецкі, які сцвярджаў, што ў школе вучыліся толькі 10 стараверaў, якія належалі да беларускай нацыянальнасці[653]. Кіраўніцтва школы намагалася не прымаць вучняў-небеларусаў: на вышэйзгаданым пасяджэнні прадстаўнік габрэйскай пачатковай школы заявіў, што ў яго школу прыйшло шмат дзетак-габрэяў, якім было адмоўлена ў прыняцці ў беларускую школу[654]. Беларускі школьны аддзел перасцерагаў дырэктараў школ, каб не прымалі вучняў-небеларусаў. Сведчыць аб гэтым ліст кіраўніка БША К. Езавітаву ад 29 лістапада 1923 г., у якім той прасіў звярнуць увагу кіраўніка Зілупскай школы, што далейшае прыймо дзяцей латгальцаў можа скончыцца перадачай школы ў Агульны школьны дэпартамент. Насцярогу Беларускага школьнага аддзела выклікаў факт, што сярод 223 вучняў дадзенай школы беларусаў было толькі 86, а астатнія былі: рускімі – 66, латгальцамі – 45, палякамі – 12, літоўцамі – 5, габрэямі – 9[655].

Рэлігійная прыналежнасць вучняў уяўляла сабой канфесійную мазаіку, якая адпавядала рэлігійнаму складу латгальскіх беларусаў. На Лудзеншчыне

[652] LVVA, 2125 f., 5 ap., 230 l., 32 lp.
[653] LVVA, 2125 f., 5 ap., 126 l., 71 lp.
[654] LVVA, 2125 f., 5 ap., 176 l., 113 lp.
[655] LVVA, 2125 f., 5 apr., 256 l., 74 lp.

пераважалі праваслаўныя. У прыватнасці, у 1921/22 гг. у гэтым павеце сярод вучняў было: 1 397 праваслаўных, 680 каталікоў і 213 прадстаўнікоў іншых веравызнанняў (стараверaў, лютэранаў, іўдзеяў). Падзел паводле полу выглядаў наступным чынам: 1 368 хлопчыкаў і 992 дзяўчынкі[656]. Можна падаць звесткі ў дачыненні да асобных школ. Напрыклад, у Ляўдарскай школе ў сакавіку 1923 г. з 118 вучняў былі толькі 2 каталікі і 2 іўдзеі, а ўсе астатнія належалі да праваслаўнага веравызнання[657]. Аднак у некаторых школах Лудзенскага павету большасць навучэнцаў складалі каталікі. Прыкладам можа быць Залеская школа, якая ў 1922/23 гг. пачала працу (23 кастрычніка), маючы39 вучняў. Цягам некалькіх месяцаў іх колькасць выросла да 99, з якіх 82 былі каталікамі і 17 праваслаўнымі[658]. 1 лістапада 1923 г. кіраўнік школы інфармаваў, што ў школе налічваецца ўжо 107 вучняў, у тым ліку: 86 каталікоў і 21 праваслаўных[659]. Колькасная перавага каталікоў адзначалася і ў Рунданскай школе.

Табліца 25. Рэлігійны склад Рунданскай школы ў 1922/23 гг.

Класы	Праваслаўныя	Каталікі	Стараверы	Іўдзеі
Падрыхтоўчы	4	14	4	0
I	2	2	5	0
II	2	5	3	0
III	6	5	0	1
IV	1	3	3	0
Разам	14	29	15	58

Крыніца: LVVA, 2125 f., 5 ap., 207 l., 34 lp.

Вучні-каталікі дамінавалі ў большасці вясковых школ на Даўгаўпілшчыне. Да выняткаў належала школа ў Даўгаўпілсе: у 1922 г. у ёй было 27 праваслаўных, 25 стараверaў, 12 каталікоў і 4 іўдзеі[660].

Падчас планавання калядных і велікодных вакацый школьнае кіраўніцтва мусіла браць пад увагу стракаты рэлігійны склад вучняў. Напрыклад, у 1924/25 гг. Беларускі школьны аддзел вырашыў, што велікодныя канікулы ў школах, размешчаных на абшары з перавагай праваслаўнага насельніцтва, павінны адбыцца ў перыяд з 20 красавіка да 4 траўня, у школах

[656] Уласны падлік на падставе: К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, Рыга 1927 [перадрук: Нью-Ёрк – Менск 2013, с. 73–79.

[657] LVVA, 2125 f., 5 ap., 159 l., 1 lp.

[658] LVVA, 2125 f., 5 ap., 230 l., 32 lp.

[659] LVVA, 2125 f., 5 ap., 230 l., 50 lp.

[660] LVVA, 2125 f., 5 ap., 35 l., 25–27 lpp.

з перавагай каталікоў – з 13 па 27 красавіка, а ў школах з мяшаным насельніцтвам – з 17 па 30 красавіка[661].

Паводле сацыяльнага складу большасць вучняў беларускіх школ складалі дзеці незаможнага сялянства. У сем'ях навучэнцаў панавала галеча, з якой былі вымушаны лічыцца настаўнікі. Адзін з сучаснікаў такім чынам апісваў вучняў школы ў Лудзы: "*Дзеці, большасці з гэтых беларусаў, да адчынення ў лютым 1922 года сваёй беларускай школы, зусім не мелі магчымасці вучыцца. Не было ў іх ні вопраткі, ні грошай на сшыток і кніжкі, а шмат хто з дня ў дзень рэгулярна галадаваў. Беларуская школа, пачынаючы з лютага 1922 года, ішла ўсім гэтым дзецям чым толькі магла на спатканне. Вечарынамі, латарэямі, працэнтнымі адлічэннямі ад пенсіі настаўнікаў збіраліся грошы на сшыткі, кніжкі і гарбату для вучняў; шмат каму даваліся вопратка і абутак*"[662].

Праз галечу вучні нерэгулярна наведвалі заняткі. Незаможныя сяляне ў зруйнаванай вайной краіне не былі ў стане выпраўляць сваіх дзетак у школы, якія месціліся далёка ад іх вёсак, бо не маглі заплаціць за інтэрнат. У сувязі з гэтым, дзеяч лічыў, што неабходна вызваліць ад аплат 50% вучняў, а астатнім даць 50% зніжкі[663]. Акрамя таго, у веснавы і восеньскі час многія вучні мусілі дапамагаць бацькам на полі, а таксама ішлі ў пастушкі, каб дапамагчы сям'і. Напрыклад, з 68 вучняў Даўгаўпілскай школы ажно 21 не наведваў заняткі ў перыяд веснавых прац, у сувязі з тым, што "выбылі ў пастухі"[664]. 15 лістапада 1922 г. кіраўнік Залескай школы інфармаваў БША, што ён не ў стане рэалізаваць школьную праграму ў неабходным аб'ёме з прычыны кепскага наведвання вучнямі школы ў восеньскі і веснавы час. Настаўнік падкрэсліваў, што большасць вучняў – сялянскія дзеці, якія мусяць працаваць на полі, а не хадзіць у школу[665]. Варта дадаць, што новы навучальны год школа пачала (18 кастрычніка 1923 г.) пры наяўнасці 25 вучняў. Тым часам, паводле журналу, усіх вучняў у школе налічвалася 107[666]. У 1921/22 гг. у Шушкаўскай школе было 189 вучняў, з якіх заняткі рэгулярна наведалі толькі 62[667]. У сакавіку 1923 г. К. Езавітаў пісаў, што ў Нова-Слабадской школе "*ўсе вучні III клясы скончылі хадзіць у школу да канца вучэбнага года таму, што па іх заявам, ім трэба дапамагаць бацькам у працы на гаспадарцы*"[668].

---

[661] LVVA, 6845 f., 2 ap., 4 l., 96 lp.

[662] Лудзыц, *5-ігодзьдзе Люцынскае беларускае пачатковае школы*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1927, № 4(2), с. 42–43.

[663] К. Езавітаў, *Становішча беларускае школы ў Латвіі*, Вільня 1923, с. 25.

[664] LVVA, 2125 f., 5 ap., 35 l., 25–27 lpp.

[665] LVVA, 2125 f., 5 ap., 230 l., 30 lp.

[666] LVVA, 2125 f., 5 ap., 230 l., 50 lp.

[667] LVVA, 2125 f., 5 apr., 214 l., 10 lp.

[668] LVVA, 2125 f., 5 apr., 134 l., 2 lp.

А ўзімку частка вучняў не наведвала школы, бо не мела цёплай вопраткі. Кіраўнік Юхнявецкай школы Віктар Дзяргач адзначаў (19 студзеня 1923 г.), што "*шмат дзетак ня могуць хадзіць у школу дзеля таго, што не маюць абуцця і вопраткі, а каторыя і ходзяць то страшэнна абадраны і ў апорках на босую нагу*"[669]. Падобным чынам выглядала становішча ў іншых школах (напрыклад, у Краславе), кіраўнікі якіх прасілі дапамогі ў забеспячэнні вучняў вопраткай і абуткам[670]. У студзені 1924 г. кіраўнік Дудэльскай школы Сцяпан Махноўскі інфармаваў Беларускі школьны аддзел, што запланаваная экскурсія вучняў у Рыгу не адбылася з наступных прычын: "*дальняе растаяніе ад станцыі (25 в.), зімовую пару і дрэнную адзежу вучняў*"[671]. Пэўнае ўяўленне пра матэрыяльны стан вучняў у некаторых школах даюць справаздачы справавода БША Я. Шчорса, які ў 1922/23 гг. наведаў шэраг школ з інспекцыяй. Пасля праверкі Юхнявецкай школы ў красавіку 1922 г. інспектар пісаў: "*Вучні робяць добрае ўражанне і добра адказваюць на пытанні; кідаецца ў вочы толькі надзвычайная беднасць многіх з іх, апранутых у падзёртыя кашулі і апоркі на босую нагу, з гэтага бачу, што школка вельмі нуждаецца ў дапамозе безграшовымі падручнікамі і нават вопраткамі і боцікамі*"[672]. Адначасова ён адзначаў, што насельніцтва Пасіенскай воласці ў сувязі з незаможнасцю, нізкім культурным узроўнем і адсутнасцю разумення значэння асветы ў жыцці чалавека абыякава ставіцца да таго, ходзяць іх дзеці ў школу ці не[673].

Культурнае жыццё. Ад самага пачатку існавання беларускія школы сталі асяродкамі культурнага жыцця і цэнтрамі нацыянальна-культурнага выхавання моладзі. У першым звароце кіраўніцтва БША да настаўніцтва 7 лістапада 1921 г. адзначалася, што настаўнікі мусяць не толькі займацца педагагічнай працай, але і ладзіць культурна-асветныя мерапрыемствы для жыхарства (чытанні, прэса, музычныя вечарыны і г.д.)[674]. Адной з праяў культурнай дзейнасці была тэатральная і музычная актыўнасць настаўнікаў і вучняў. У архіўных крыніцах захаваліся звесткі пра шматлікія культурныя мерапрыемствы ў школьных мурах. Варта прывесці некалькі найбольш яскравых прыкладаў. У 1922/23 гг. у 2-й Прыдруйскай школе адбылася вечарына, падчас якой навучэнцы спявалі песні *Чаму ж мне не пець* і *Саўка ды Грышка ладзілі дуду*, а таксама чыталі вершы *Родны край* і інш.[675]

---

669 LVVA, 2125 f., 5 ap., 136 l., 27 lp.
670 LVVA, 2125 f., 5 ap., 146 l., 24 lp.
671 LVVA, 2125 f., 5 apr., 130 l., 12 lp.
672 LVVA, 2125 f., 5 ap., 136 l., 7 lp.
673 LVVA, 2125 f., 5 apr., 34 l., 213 lp.
674 LVVA, 2125 f., 5 ap., 67 l., 18 lp.
675 LVVA, 2125 f., 5 ap., 35 l., 73 lp.

14 жніўня 1923 г. у памяшканні беларускай летняй дзіцячай калоніі ў Вышках П. Мядзёлка-Грыб зладзіла канцэрт беларускага хору, а Я. Камаржынскі паставіў спектакаль[676].

Актыўнасць праяўлялі слухачы настаўніцкіх курсаў. Улетку 1922 г. курсанты пад кіраўніцтвам Я. Камаржынскага і Э. Будзькі стварылі драматычную трупу, якая амаль кожную суботу ладзіла спектаклі на сцэне Даўгаўпілскага клуба "Saule". На сцэне ставіліся спектаклі *Чорт і баба*, *Модны шляхцюк*, *На вёсцы*, *Конскі партрэт*, *Пасланец* і інш.[677] У 1922–1923 гг. трупа курсантаў пад кіраўніцтвам Я. Камаржынскага ставіла беларускія спектаклі ў Прыдруйску. У 1922–1924 гг. аматарскія тэатральныя гурткі існавалі ў наступных школах: Шнёкаўскай (кіраўнік М. Талерка); Краслаўскай (кіраўнік Д. Казлоўскі); Рыжскіх (кіраўнікі Н. Пінская, М. Дзямідаў, Л. Клагіш). Гурток Шнекаўскай школы пачынаў з батлейкі, але потым перайшоў да пастаноўкі п'ес. Яго рэпертуар складаўся з беларускіх і перакладных твораў: *Міхалка*, *Атрута*, *Конскі партрэт*, *Збянтэжаны Саўка*, *Модны шляхцюк*, *Пасланец*, *Калісь*, *Стараста*, *Салдацкая любоў*, *У суседзі*, *На волас ад смерці*, *Вольнае каханне*, *Чужы каравай*, *Крыса*, *Падзяліліся*, *Жонка без грошай* і інш. Выступы адбываліся ў мурах школы, а таксама ў Прыдруйску, Пустыні і Зілупе. Відавочцы апісвалі ўмовы, у якіх адбываліся спектаклі: "*Будынак, у якім рабіліся ўсе тыя пастаноўкі вясковага рэпертуару, – звычайная хата селяніна Вурбановіча, у якога раней была школа і які дапамагаў у спектаклях (...) Для сцэны абводзіўся куток у 3х4 аршыны, і вось на гэткай маленькай сцэне ставілі што маглі. Дэкарацыі з паперы, вешалі на сценкі. Акно часамі было і дзвярмі. Суфлёр стаяў у куточку каля печы. Сцэна паднята на паўаршына, бо далей нельга, а заслонай служыла старая карта 'Фельдпочты Россійской Имперіи'. У зале ўмяшчалася каля 75 чалавек. Артысты павінны былі быць і акрабатамі. Часамі былі з'явы гэткія: ідзе ў адны дзверы, а ўваходзе ў другія, выскачыць які артыста праз адно акно, ды як махане кругом усіх будынкаў, каб абляцець і ўлезці ў другое акно на сцэну. Нягледзячы, што так цяжка было ставіць, адбыўся цэлы рад спектакляў, які вельмі задаволіў сялян, даў ім забаву і адпачынак*"[678]. На пачатку 1924 г. сярод беларускай меншасці наспявала думка пра стварэнне на базе школьных гурткоў беларускага тэатра ў Латвіі[679].

---

[676] *З Латвіі,* "Крывіч" 1923, № 3, с. 62.

[677] К. Езавітау, *Спробы беларускага нацыянальнага тэатру у Латвіі*, "Голас беларуса" 1925, № 2 ад 20 чэрвеня, с. 1.

[678] К. Езавітаў, *Спробы беларускага нац. тэатру у Латвіі*, "Голас беларуса" 1925, № 3 ад 1 ліпеня, с. 1.

[679] Кастусёнак, *Беларускі Народны Тэатр у Рызе*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1928, № 8(1), с. 120–121.

З дзейнасцю беларускіх школ звязаныя першыя спробы этнаграфічных даследаванняў латвійскіх беларусаў. Рашэнне збіраць вусную і матэрыяльную этнаграфічную спадчыну было прыняла на настаўніцкім кангрэсе 10–12 жніўня 1923 г. у Даўгаўпілсе. У пастанове кангрэсу чытаем: "*Прапанаваць усяму вучыцельству ў збіранні розных этнаграфічных матэрыялаў (паясы, кашулі (рубахі), спадніцы, партакі, світкі, лапці, дудкі, шапкі, мадэлі сахі, бараны, будаў з іх унутранай абставай, рэчы прыхарашэння і інш. рэчы) па магчымасці збіраць у двух экзэмплярах, каб можна было б гэты матэрыял адправіць у беларускі этнаграфічны музей. Дзеля таго, што ў гутарцы латгальска-беларускага селяніна, асабліва ў Люцыншчыне, спатыкаюцца некаторыя і часам двузначныя мясцовыя асаблівасці, запрапанаваць беларускаму вучыцельству адмячаць і запісваць усе гэтыя асаблівасці, і запісаны матэрыял перасылаць у беларускі Аддзел для састаўлення слоўніка мясцовых беларускіх слоў*"[680]. Далей у дакументе адзначалася: "*Беларуская ўправа звяртае ўвагу на гэтыя паставы, на іх вагу для развіцця беларускае культуры ў межах Латвіі і просіць вучыцельства ўзяць энергічны ўдзел у гэтай працы, прызываючы да яе ўсе свядомыя беларускія элементы (...) Што датычыцца этнаграфічнага матэрыялу, то, пажадана, каб ён па магчымасці збіраўся ў двух экземплярах і аддаваўся вучыцельствам Дзвінскага павета – дырэктару Дзвінскае беларускае сярэдняе школы І.І. Краскоўскаму, а Люцынскага пав. – дырэктару Люцынскае беларускае сярэдняе школы К.Б. Езавітаву. Беларускі этнаграфічны музей будзе адчынены ў Рызе, пры Рыжскай беларускай пачатковай школе*"[681].

11 лістапада 1923 г. К. Езавітаў звярнуў увагу кіраўніка Беларускага школьнага аддзела на тое, што бюджэт установы не прадугледжвае выдаткаў на збіранне фальклору і стварэнне беларускага музея для дзяцей. Ён прапанаваў, каб настаўнікі пачалі адлічваць на гэтую мэту 1–2% заробку[682]. Дзеяч таксама раіў кіраўніцтву БША разаслаць па школах цыркуляр з просьбай збіраць рэчы беларускай матэрыяльнай культуры (паясы, лапці, сохі, кашулі, дудкі і г.д.), каб потым праз гімназіі ў Лудзы і Даўгаўпілсе перадаваць у Рыгу[683]. Ідучы за гэтай парадай, 29 лістапада 1923 г. кіраўніцтва Беларускага школьнага аддзела заклікала настаўніцтва ўзяць актыўны ўдзел у збіранні этнаграфічнага матэрыялу. Рэчы належала па магчымасці збіраць у двух асобніках і перадаваць І. Краскоўскаму і К. Езавітаву[684]. У снежні 1923 г. С. Сахараў зноў заклікаў настаўніцтва далучыцца да збору беларускага этнаграфічнага

---

[680] LVVA, 2125 f., 5 apr., 374 l., 14 lp.; НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 48, л. 32.

[681] LVVA, 2125 f., 5 ap., 416 l., 8 lp.

[682] LVVA, 2125 f., 5 ap., 18 l., 46 lp.

[683] LVVA, 2125 f., 5 ap., 416 l., 6 lp.

[684] LVVA, 6845 f., 2 ap., 4 l., 85 lp.

матэрыялу і вуснай народнай творчасці ў Латвіі прыцягваючы да працы "ўсе свядомыя беларускія элементы". За дастаўку рэчаў для этнаграфічнага музея абяцалі грошы. Экспанаты перадаваліся беларускаму этнаграфічнаму музею, які быў створаны напрыканцы 1923 г. пры 1-й Рыжскай беларускай пачатковай школе. Больш за тое, Латвійскі этнаграфічны музей пагадзіўся стварыць беларускую калекцыю[685].

Згодна з задумай беларускіх актывістаў, на настаўнікаў ускладаўся цяжар культурна-асветнай працы як з моладдзю, так і з дарослым насельніцтвам. У лютым 1923 г. кіраўніцтва Беларускага школьнага аддзела нагадвала: "*Беларускае Упраўленне лічыць неабходым прыпомніць вучыцельству, што беларуская школа павінна быць асабліва блізка да народа і з гэтай мэтай (...) хоць раз ці два ў месяц ладзіць па нядзельных днях папулярныя чытанні для народа, на якіх весці бяседы з народам на адпаведныя тэмы, прачытаць галаўнейшыя сучасныя весткі з газет, і асабліва жадана, каб на гэткіх бяседах азнаёміць беларускае жыхарства з гісторыяй і геаграфіяй Беларусі*"[686]. У тым жа годзе С. Сахараў заклікаў кіраўнікоў беларускіх школ рупіцца пра стварэнне школьных бібліятэчак як вучнёўскіх, так і дарослых, а на грошы, выручаныя са спектакляў, выпісваць беларускую прэсу, у прыватнасці віленскі "Вольны сьцяг". Па выніках педагагічнай канферэнцыі Беларускі школьны аддзел (20 кастрычніка 1923 г.) выдаў цыркуляр да настаўніцтва: "*1) У мэтах развіцця і пашырэння нацыянальнай беларускай культуры і добрай працы ў школах, неабходна ўсім вучыцелям, працуючым у беларускіх школах, асабліва тым, якія былі адсутнымі на беларускіх вучыцельскіх курсах, самастойна паглыбіць сваю веду ў беларускай мове, літаратуры, гісторыі і іншых галінах беларускае культуры, каб запраўды нацыянальна свядома карыстацца належным аўтарытэтам у школе і сярод беларускага сялянства. 2) Беларускае вучыцельства заклікаецца ў працягу 1923/24 вучэбнага года прыняць энергічны ўдзел у працы беларускага культурна-прасветнага Т-ва 'Бацькаўшчына' шляхам арганізацыі і пастаноўкі лекцыяў з чароўным ліхтаром, спектакляў і курсаў для дарослых на вёсках у раёне сваёй школы ў мэтах нацыянальнага і культурнага адраджэння беларускага жыхарства. У мінулым годзе Беларускае Упраўленне купіла чароўныя ліхтары для Красоўскай школы Дзвінскага павета Рунданскай і Шушкаўскай школ Люцынскага павета разам з малюнкамі. Гэтымі ліхтарамі маюць карыстацца суседнія школы. Ёсць ліхтары і пры другіх школах. Беларускае Упраўленне мае і цяпер магчымасць купіць тры-чатыры ліхтары, і аб гэтым найбольш цэнтральным школам належыць узбудзіць адпаведнае хадатайства перад Упраўленнем. Малюнкі для чароўнага ліхтара па беларусазнаўстве ёсць пры Дзвінскай*

[685] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 48, л. 32; LVVA, 2125 f., 5 ap., 147 l., 19 lp.

[686] LVVA, 6845 f., 2 ap., 4 l., 45 lp.

урадовай беларускай сярэдняй школе і пры Люцынскай беларускай пачатковай школе, куды і трэба звяртацца вучыцельству за імі. Трэба, каб кожная школа рабіла не менш як два разы ў месяц лекцыі для дарослых па нядзелях пры ўдзеле вучнёўскага хору і вучнёўскай дэкламацыі. Неабходна вучашчым зрабіць крокі да арганізацыі бібліятэк як вучнёўскай, гэтак і для дарослых, а таксама, на грошы, выручаныя з спектакляў і лекцый выпісваюць газеты, і ў тым ліку беларускую 'Вольны сьцяг' з Вільні. З свайго боку Беларускае Упраўленне мае надзею папоўніць школьныя бібліятэкі беларускай літаратурай у недалёкай будучыні"[687].

У красавіку 1924 г. БША падкрэсліваў, што настаўнікі павінны зносіцца з мясцовым сялянствам, каб яно складала заявы аб адкрыцці ў іх мясцовасцях беларускіх школ[688]. У чарговай адозве Беларускага школьнага аддзела да беларускага настаўніцтва чытаем: "*Прыступая да выканання ўскладзеных на яго законам абавязкаў, Аддзел прадбачае ўсе цяжкасці папярэдняга будаўніцтва беларус. школак і ў гэтым ускладае вялікую надзею на падтрымку з боку вучыцельства. Паміж Аддзелам і вучыцельствам павінна быць аб'яднанне на грунце агульных інтарэсаў навучання і выхавання моладзі. Вучыцельства ў сваёй дзейнасці павінна апірацца на народ, яно не павінна замыкацца ў вузкай сферы школьнага навучання: беларус. школа павінна быць тым сонцам сярод вясковай цемнаты, якое сваімі праменнямі будзе цягнуць к сабе кожнага беларуса. Для гэтага Аддзел асабліва рэкамендуе вучыцельству рабіць у святы чытанні і бяседы, даваць народу магчымыя рады, арганізоўваць гурткі беларус. моладзі, народныя хоры, бібліятэкі, тэатр і інш. такім чынам вучыцельства і школа могуць быць карысным для беларускага жыхарства і быць абаронаю нацыянальнага адраджэння беларускай меншасці ў Латвіі*"[689].

Беларускі актыў пашыраў сярод настаўнікаў ідэю вядзення школьных летапісаў, у якіх належала фіксаваць звесткі пра арганізацыю школы, яе фінансаванне, школьнае жыццё (стан будынка, маральнае і фізічнае выхаванне, стаўленне бацькоў да школы). Пастанова пра вядзенне летапісаў была прынятая на беларускім настаўніцкім з'ездзе 10–12 жніўня 1923 г. у Даўгаўпілсе. Згодна з гэтай пастановай, абавязак вядзення летапісу ўводзіўся пачынаючы з 1923/24 гг.[690]

Беларускія дзеячы рабілі спробы наладзіць выданне настаўніцкага часопіса. У лютым 1923 г. кіраўніцтва Беларускага школьнага аддзела паінфармавала дырэктараў беларускіх школ, што БША супольна з таварыствам "Бацькаўшчына" мае намер пачаць выданне беларускага альманаха

---

687 LVVA, 6845 f., 2 ap., 4 l., 78 lp.; НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 48, л. 26.

688 LVVA, 6845 f., 2 ap., 4 l., 120 lp.

689 НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 110, л. 13.

690 LVVA, 2125 f., 5 ap., 67 l., 57, 73 lpp.

ў Латвіі. Паводле задумы беларускага актыву, выданне праектавалася як літаратурна-навуковае і непалітычнае. Альманах павінен быў называцца "Школа і жыццё", а выдавацца супольнымі намаганнямі БША і таварыства "Бацькаўшчына". Меркавалася, што выданне будзе мець наступныя раздзелы: літаратурна-грамадскі, навукова-гістарычны, педагагічны і справаздаўчы (спісы школ і настаўнікаў, навучальныя праграмы). БША звярнуўся да беларускага настаўніцтва з заклікам падтрымаць выданне дасылаючы матэрыялы (апавяданні, народныя легенды і прыказкі, народныя песні, вершы і артыкулы па пытаннях гісторыі, этнаграфіі і грамадскага жыцця, вучнёўскія творы фотаздымкі храмаў і сялянскага побыту (вяселлі, кірмашы), прапановы і праекты па рэарганізацыі школьнай працы, уласныя думкі наконт школы і насельніцтва). У выпадку атрымання матэрыяльнай падтрымкі, не выключалася стварэнне вучнёўскага раздзела, дзе меркавалася друкаваць творы моладзі. Матэрыялы прапаноўвалася дасылаць у Беларускі школьны аддзел не пазней за 1 красавіка 1923 г.[691]

Прапанова знайшла разуменне сярод дзейнай часткі лудзенскага і даўгаўпілскага настаўніцтва. У лютым 1923 г. адбыліся сходы лудзенскага і даўгаўпілскага аддзелаў таварыства "Бацькаўшчына" і лудзенскіх настаўнікаў з удзелам кіраўніка БША. На іх была абмеркаваная справа выдання беларускага часопіса. У Лудзы прысутныя выказалі думку, што перыёдык павінен мець літаратурна-навуковы характар з карэспандэнцыяй пра становішча беларускай вёскі ў Латвіі. Удзельнікі лічылі, што выданне павінна выходзіць не менш як 10 разоў на год (за выняткам летніх месяцаў), а першы нумар мае пабачыць свет напрыканцы красавіка[692]. Тым часам, Даўгаўпілскі аддзел таварыства планаваў стварыць беларускае выдавецтва па прыкладзе віленскага Беларускага выдавецкага таварыства. Было вырашана, што сябры ініцыятыўнай групы па выданні альманаха будуць збіраць сродкі на выданне. Настаўнікі С. Казека, Р. Плыгаўка, М. Іваноў і А. Арлоў ахвяравалі па 50 руб. Нарада вырашыла таксама звярнуцца да У. Корці, каб ён стаў скарбнікам выдавецтва. Падрыхтоўкай часопіса павінны былі заняцца П. Мядзёлка-Грыб і У. Пігулеўскі[693]. У снежні 1923 г. БША прасіў, каб настаўніцтва выдаткавала на часопіс прынамсі 1–2% прыбытку ад школьных вечарын і спектакляў[694].

У межах культурна-асветнай працы з моладдзю Беларускі школьны аддзел ладзіў падчас вакацый экскурсіі настаўнікаў і вучняў у Рыгу і Даўгаўпілс[695].

---

[691] LVVA, 6845 f., 2 ap., 4 l., 45 lp.

[692] LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 47 lp.

[693] LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 60 lp.; НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 112, л. 1; НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 106, л. 9.

[694] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 48, л. 26.

[695] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 47, л. 4; Тамсама, спр. 48, л. 33.

Напрыклад, у жніўні 1924 г. вучні беларускіх школ наведалі ў Рызе вучнёўскую выставу[696].

У беларускіх школах адзначалі агульналатвійскія святы і ўрачыстасці. Напрыклад, загадам кіраўніцтва БША ад 12 траўня 1922 г., настаўнікі і вучні вызваляліся ад заняткаў 27 траўня ў сувязі з Днём дзіцяці. У гэты дзень было загадана зладзіць лекцыі для вучняў, а па магчымасці і для бацькоў (тэмы: гігіена, фізічнае і маральнае выхаванне)[697]. 14 сакавіка 1923 г. у беларускіх школах адбыліся жалобныя сходы настаўнікаў і вучняў у сувязі са смерцю латышскага пісьменніка Крыш'яніса Баронса (*Krišjānis Barons*)[698].

Сярэднія школы

Згодна з латвійскай адукацыйнай палітыкай, сярэднюю асвету давала гімназія. Узровень падрыхтоўкі ў гэтых установах адпавядаў навучальным стандартам 5–8 класаў дарэвалюцыйнай расійскай мужчынскай гімназіі. У гімназію маглі паступіць выпускнікі пачатковых школ. Існавала, аднак, розніца паміж тымі, хто скончыў 6- і 4-гадовыя школы. Першыя прымаліся ў гімназію без іспытаў. Тым часам выпускнікі 4-гадовых пачатковых школ мелі дзве магчымасці: здаваць уступныя іспыты ў 1-ы клас або ісці ў падрыхтоўчы. Апошні складаўся з двух груп (малодшай і старэйшай). Асобы з 5-гадовай пачатковай асветай прымаліся ў 2-гі пачатковы клас, пасля сканчэння якога ахвотныя паступіць у 1-ы клас гімназіі мусілі вытрымаць іспыты[699].

Беларускі актыў Латвіі разумеў, што праблема адукацыі беларускай меншасці не будзе вырашана без магчымасці атрымання сярэдняй асветы на роднай мове. Паколькі ўласных гімназій не было, беларусы вучыліся ў сярэдніх школах іншых нацыянальнасцей. Некаторыя з іх ішлі на кантакт з беларускімі асветнымі ўстановамі. У таварыства "Бацькаўшчына" звярталіся вучні рускіх гімназій, якія прасілі грошай на далейшае навучанне. У сакавіку 1922 г. гэта зрабілі вучаніцы Даўгаўпілскай жаночай гімназіі Антаніна Салаўёва і Кацярына Марозава, якія не мелі грошай на аплату за навучанне[700]. 1 ліпеня 1922 г. у Беларускі школьны аддзел звярнуўся Антось Ярмак, студэнт Латвійскай Кансерваторыі, які прасіў дапамогі на навучанне[701]. І пазней людзі не пераставалі звяртацца ў БША з такімі запытамі.

---

[696] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 46, л. 7.
[697] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 47, л. 12, 13.
[698] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 48, л. 8.
[699] LVVA, 2125 f., 5 ap., 58 l., 1 lp.
[700] LVVA, 2125 f., 5 ap., 392 l., 29 lp.
[701] LVVA, 2125 f., 5 ap., 392 l., 55 lp.

Здаралася, што гэта былі вучні, якім у выпадку неаплаты навучання пагражала выключэнне са школы[702].

Даўгаўпілская дзяржаўная беларуская гімназія (*Daugavpils Valsts baltkrievu vidusskola*). У святле вышэйзгаданага не павінна здзіўляць, што беларускі актыў з першых дзён існавання беларускіх школ намагаўся стварацьгімназіі. Думку аб адкрыцці беларускіх сярэдніх школ і сельскагаспадарчай школы асабліва фарсіраваў К. Езавітаў. Адкрыць беларускія гімназіі было магчыма падпарадкаваўшы юрысдыкцыі БША ўжо існуючыя сярэднія школы. Беларускія дзеячы бачылі патрэбу заснаваць гімназіі перадусім у сталіцы Латгаліі, дзе маглі б працягваць асвету выпускнікі вясковых беларускіх пачатковых школ. Даўгаўпілскі беларускі актыў вёў працу сярод бацькоў вучняў мясцовых гімназій, каб яны падтрымалі ідэю адкрыць беларускую сярэднюю школу. Напрыканцы 1921 г. на кватэры Я. Харлапа адбыліся два сходы бацькоў 2-й Даўгаўпілскай дзяржаўнай рускай сярэдняй школы, у якой вучылася частка беларускай моладзі. Пазней К. Езавітаў наступным чынам апісаў гэтую падзею: "*пасля гарачых спрэчак з абмаскаленаю большасцю, выявілася і згуртавалася свядома-прыхільная група бацькоў-беларусаў, якая потым і аддала сваіх дзяцей у 1-ю Дзвінскую асноўную беларускую школу*"[703].

Перашкодай на шляху арганізацыі беларускай гімназіі быў нізкі ўзровень нацыянальнай свядомасці беларускамоўнага насельніцтва. Аляксей Барткевіч, які 16-гадовым юнаком агітаваў вучнёўскую моладзь на карысць беларускай гімназіі, пазней узгадваў: "*Гэта было цяжка, бо абмаскалены беларус горш расейца (...) У 1922 годзе арганізавалі Даўгаўпілскую беларускую гімназію. Трэба былі вучні. Вучыўся я ў расейскай гімназіі. Сярод вучняў было шмат беларусаў, але вельмі абмаскаленых (...) Так што арганізацыйны перыяд быў цяжкі. Цяжка было пераконваць хлапцоў, каб ішлі вучыцца ў беларускую гімназію*"[704]. Кіраўніцтва мясцовай рускай гімназіі вяло сярод насельніцтва моцную агітацыю супраць адкрыцця беларускага адпаведніка. Вось што пісала П. Мядзёлка: "*Справа ў тым, што побач з беларускай гімназіяй знаходзіўся добра адрамантаваны і як належыць абсталяваны будынак рускай гімназіі, дырэктар якой Садоўскі павёў моцную агітацыю супраць наша гімназіі. Ён нават на рынку залазіў на бочку і адтуль крычаў, што беларуская гімназія ствараецца на бальшавіцкія грошы. ʼасцерагайцеся*

---

[702] LVVA, 2125 f., 5 ap., 392 l., 103 lp.

[703] К. Езавітаў, *Беларускае Культурна-Асьветнае Т-ва "Бацькаўшчына" ў Латвіі*, Рыга 1932, с. 3; *Крывіцкія руны. Вып. II: Беларускі культурны мацярык у Латвіі*, укл.: М. Казлоўскі, С. Панізьнік, Менск 2017, с. 317.

[704] *Крывіцкія руны. Вып. II: Беларускі культурны мацярык у Латвіі*, укл.: М. Казлоўскі, С. Панізьнік, Менск 2017, с. 306, 309.

туды пасылаць сваіх дзяцей, -- казаў ён, -- бо неўзабаве іх запруць у вагоны і адправяць у Саветы"[705].

Намаганні беларускага актыву прынеслі плён. 20 студзеня 1922 г. ва ўправу таварыства "Бацькаўшчына" паступіла петыцыя ад 44 бацькоў, якія патрабавалі адкрыцця беларускай сярэдняй школы ў Даўгаўпілсе. У гэтай петыцыі чытаем: "*Жадаючы даць магчымасць дзеткам, якія скончылі ў гэтым годзе пачатковую школу, сярэднюю асвету і не маючых на тое сродкаў, просім аб адчыненні з пачатку новага вучэбнага года ў м. Дзвінску беларускай гімназіі*"[706].

Новай гімназіі патрабаваўся дырэктар. Рада Беларускага школьнага аддзела прадставіла міністру асветы кандыдатуру Івана Краскоўскага, які на той час яшчэ знаходзіўся ў Коўне. Апошні быў зацверджаны на кіроўнай пасадзе 4 красавіка 1922 г. З распараджэння міністра вынікае, што І. Краскоўскі выконваў свае абавязкі з 1 красавіка. У хуткім часе дырэктар прыбыў у Даўгаўпілс, дзе супольна з К. Езавітавым пачаў працу па арганізацыі гімназіі[707]. Першымі заданнямі беларускага актыву быў пошук памяшкання, набор вучняў і настаўнікаў, арганізацыя інвентару і мэблі. Падчас вайны Даўгаўпілс быў моцна разбураны, што ўскладняла пошук адпаведнага будынку. У рэшце рэшт было вырашана адаптаваць 2-павярховы будынак на вуліцы Варшаўскай 16 (*Varšavas iela*), у якім да І сусветнай вайны ў месцілася 2-я гарадская вучэльня. Будынак належаў мясцоваму жыхару Бруднаму, які быў гатовы здаць яго ў арэнду беларусам. Камяніца знаходзілася ў раёне Новы горад (*Jaunbūve*). Выбар месца быў невыпадковы, менавіта тут жыла значная колькасць даўгаўпілскіх беларусаў. Будынак меў 19 пакояў, у тым ліку вялікую залу[708]. Аднак ён патрабаваў грунтоўнага рамонту, паколькі раней у ім адбыўся пажар. Адна з настаўніц гімназіі Паўліна Мядзёлка-Грыб пісала: "*Фактычна гэта былі чатыры сцяны, якія засталіся пасля пажару. Ні даху, ні акон, ні столі, ні ўнутраных перагародак. Усё трэ было будаваць нанава*"[709]. Да камяніцы прылягалі два драўляныя будынкі, якія арганізатары гімназіі хацелі аддаць пад інтэрнат, але праз адсутнасць грошай былі вымушаны адмовіцца ад гэтай задумы[710].

---

[705] П. Мядзёлка, *Сцежкамі жыцця*, Менск 2018, с. 323.

[706] К. Езавітаў, *Беларускае Культурна-Асьветнае Т-ва "Бацькаўшчына" ў Латвіі*, Рыга 1932, с. 16–18; *Гістарычны нарыс пяцігодзьдзя Дзьвінскай Дзяржаўнай Беларускай Гімназіі за 1922–1927 г.г.*, укл.: С. Сахараў, Дзьвінск 1927, с. 5.

[707] *Гістарычны нарыс пяцігодзьдзя Дзьвінскай Дзяржаўнай Беларускай Гімназіі за 1922–1927 г.г.*, укл.: С. Сахараў, Дзьвінск 1927, с. 5–6.

[708] *Гістарычны нарыс пяцігодзьдзя Дзьвінскай Дзяржаўнай Беларускай гімназіі за 1922–1927*, укл.: С. Сахараў, Дзьвінск 1927, с. 5–6; К. Езавітаў, *Беларускае Культурна-Асьветнае Т-ва "Бацькаўшчына" ў Латвіі*, Рыга 1932, с. 19.

[709] П. Мядзёлка, *Сцежкамі жыцця*, Менск 2018, с. 318.

[710] T. Błaszczak, I. Matiash, D. Michaluk, *Iwan Kraskowski (1880–1955). W służbie Białorusi i Ukrainie*, Białystok 2019, s. 170.

Сродкі на арганізацыю гімназіі (закуп мэблі і падручнікаў, рамонт будынка) выдаткавала соймавая бюджэтная камісія на запыт Я. Райніса, міністра асветы Аляксандра Даўгэ і віцэ-міністра Валерыі Сейле. Міністэрства асветы прызначыла на гэтыя мэты 1 255 860 рублёў[711]. 15 ліпеня 1922 г. Рада Беларускага школьнага аддзела ўсклала адказнасць за рамонт на гаспадара будынка, а нагляд за рамонтам даручыла камісіі ў складзе К. Езавітава, І. Краскоўскага і павятовага інжынера Яніса Комісарса (*Janis Komisārs*). На патрэбы рамонту Рада БША выдаткавала 270 тыс. руб.[712] Улетку 1922 г. будынак быў адрамантаваны, падключаны да вадаправоду і электрычнасці, і заняткі ў школе пачаліся своечасова. Агульны кошт рамонту склаў 308 400 латвійскіх рублёў. Акрамя гімназіі, у адрамантаваным будынку знаходзілася 4-класная беларуская пачатковая школа, якая займала першы паверх, а ў адным з пакояў закватараваўся дырэктар І. Краскоўскі. У другую змену ў будынку працавалі беларускія настаўніцкія курсы і латышская рамесніцкая школа. Разам у будынку знаходзілася каля 400 чал.[713] Акрамя таго, з верасня 1922 г. будынак гімназіі стаў сядзібай кіраўніцтва таварыства "Бацькаўшчына". За грошы з арэнды, якую беларусы плацілі гаспадару, апошні рамантаваў будынак (напраўляў печы, пабудаваў хлеў на дровы, паставіў плот)[714].

У першыя гады існавання гімназіі ў ён працавалі такія настаўнікі, як – Паўліна Мядзёлка-Грыб (беларуская мова і літаратура), Уладзімір Пігулеўскі (гісторыя Беларусі), Вільгельм Зінкевіч (латышская мова і гісторыя Латвіі), Уладзімір Корці (матэматыка), Парфіры Жэрдзі (прыродазнаўчыя навукі), Эла Стэфановіч (нямецкая мова), Андрэй Якубецкі (геаграфія), Іван Краскоўскі (усеагульная гісторыя), Ніна Фельдман, а. Сава Трубіцын (праваслаўны катэхет), кс. Антоніс Шылініс (каталіцкі катэхет)[715]. Звяртае на сябе ўвагу міжнацыянальны склад педагогаў. У 1923/24 гг. у гімназіі працавалі беларусы І. Краскоўскі, П. Мядзёлка-Грыб, У. Корці, Я. Кастылюк, Ніна Фельдман, А. Якубецкі, У. Пігулеўскі, латыш В. Зінкевіч, рускія Уладзімір Калашнікаў і а. С. Трубіцын, літовец а. А. Шылініс, украінец Парфіры Жэрдзі[716]. Частка настаўнікаў не мела латвійскага грамадзянства, што ўскладняла працу школы. Паколькі змянілася латвійскае заканадаўства, і цяпер іншаземцы не маглі займаць пасады кіраўнікоў сярэдніх школ, 23 жніўня 1923 г. педагагічная рада гімназіі вырашыла звярнуцца да міністра асветы

---

[711] *Гістарычны нарыс пяцігодзьдзя Дзьвінскай Дзяржаўнай Беларускай Гімназіі за 1922–1927 г.г.*, укл.: С. Сахараў, Дзьвінск 1927, с. 5.

[712] LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 4 lp.

[713] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 110, л. 11–12, 15.

[714] *Гістарычны нарыс пяцігодзьдзя Дзьвінскай Дзяржаўнай Беларускай Гімназіі за 1922–1927 г.г.*, укл.: С. Сахараў, Дзьвінск 1927, с. 10.

[715] LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 103 lp.

[716] LVVA, 2125 f., 5 ap., 259 l. 18 lp.

з просьбай пакінуць І. Краскоўскага на пасадзе дырэктара праз адсутнасць у Латвіі беларускіх нацыянальных кадраў[717]. Іншаземцам быў таксама кс. А. Шылініс, таму педрада (16 лістапада 1923 г.) прасіла Міністэрства асветы дазволіць яму працаваць у бягучым навучальным годзе, паколькі святар быў адзіным духоўнікам у Даўгаўпілсе, які ведаў беларускую мову[718]. Праз адсутнасць латвійскага грамадзянства не дазволілі працаваць у гімназіі Сяргею Казеку. З цягам часу педагагічны калектыў гімназіі мяняўся. 1 лютага 1925 г. педрада гімназіі ўзяла на працу настаўніка беларускай мовы Станіслава Красневіча, бо ён "біўся за свабоду Латвіі" г.зн. быў удзельнікам вайны за незалежнасць Латвіі[719].

Істотную ролю ў жыцці гімназіі адыгрывала школьная рада, якая складалася з прадстаўнікоў настаўніцтва і бацькоў. 29 кастрычніка 1922 г. адбыўся першы агульны сход педагогаў і бацькоў і быў абраны першы склад школьнай рады, у якую ўвайшлі: бацькі К. Антонаў, М. Дарафееў, М. Лугоўскі, Б. Пырсікаў, С. Салаўёва, настаўнікі І. Краскоўскі, Н. Фельдман, П. Мядзёлка-Грыб, А. Якубецкі. 31 кастрычніка адбылося арганізацыйнае пасяджэнне школьнай рады, на якім старшынём быў абраны І. Краскоўскі, сакратаром А. Якубецкі, скарбнікам К. Антонаў[720]. Супрацоўніцтва паміж кіраўніцтвам і школьнай радай не заўсёды было бясхмарным. 8 лютага 1925 г. дырэктар І. Краскоўскі падчас пасяджэння педрады заявіў, што лічыць школьную раду несапраўднай, паколькі яна не мае ні старшыні, ні сакратара[721]. У выніку на пасяджэнні педрады 25 лютага ад настаўнікаў у школьную раду аднагалосна былі абраны: С. Сахараў, Я. Кастылюк, В. Зінкевіч, У. Радкін і С. Красневіч[722].

На першым пасяджэнні педрады гімназіі (26 жніўня 1922 г.) было вырашана, што гімназія будзе мець профіль прагімназіі з вывучэннем лаціны[723]. Навучальная праграма складалася з агульнашкольных прадметаў, але ўключала ў сябе беларускую мову і беларусазнаўства. У кожным класе чатыры гадзіны ў тыдзень былі прысвечаныя вывучэнню беларускай мовы. Акрамя таго, беларуская мова была мовай выкладання ўсіх прадметаў, акрамя латышскай мовы, гісторыі і геаграфіі Латвіі. На прапанову І. Краскоўскага 26 верасня 1922 г. педрада вырашыла ўвесці прадмет славяназнаўства па адной лекцыі ў тыдзень[724]. Кіраўніцтва гімназіі рупілася, каб вучні не толькі вывучалі

---

[717] LVVA, 2067 f., 1 ap., 367 l., 42 lp.

[718] LVVA, 2067 f., 1 ap., 367 l., 54 lp.

[719] LVVA, 2067 f., 1 ap., 367 l., 96 lp.

[720] *Гістарычны нарыс пяцігодзьдзя Дзьвінскай Дзяржаўнай Беларускай Гімназіі за 1922–1927 г.г.*, укл.: С. Сахараў, Дзьвінск 1927, с. 27.

[721] LVVA, 2067 f., 1 ap., 367 l., 51 lp.

[722] LVVA, 2067 f., 1 ap., 367 l., 52 lp.

[723] LVVA, 2067 f., 1 ap., 367 l., 1 lp.

[724] LVVA, 2067 f., 1 ap., 367 l., 5 lp.

родную мову, але і атрымлівалі веды пра культуру і гісторыю свайго народа. З гэтай мэтай уводзіўся прадмет па беларусазнаўстве. На пасяджэнні педрады гімназіі 8 лістапада 1923 г. была адхіленая прапанова К. Езавітава пра зраўнанне колькасці гадзін лекцый па беларусазнаўстве з колькасцю гадзін замежных моў[725]. У 1923 г. кіраўніцтва гімназіі пры падтрымцы Беларускага школьнага аддзела распрацавала праект ператварэння гімназіі ў тэхнікум[726]. З гэтай мэтай педрада 20 ліпеня 1923 г. стварыла працоўную камісію (І. Краскоўскі, П. Жэрдзі, У. Корці)[727].

Беручы пад увагу, што ў Даўгаўпілскім павеце адсутнічалі 6-класныя беларускія пачатковыя школы, у гімназіі былі створаны два падрыхтоўчыя класы (аддзяленні). Уступныя іспыты ў гімназію, якія прайшлі з 5 да 11 верасня 1922 г., ахоплівалі наступныя прадметы: Закон Божы, латышская, беларуская, нямецкая і руская мовы, гісторыя, геаграфія і прыродазнаўства, фізіка і матэматыка[728]. На іспыце па беларускай мове патрабаваліся веды чытання на падставе падручніка *Родны край* (ч. 3 і 4) і граматыкі Браніслава Тарашкевіча, а таксама дэкламацыі вершаў[729]. Некаторыя кандыдаты не маглі прадставіць дакументаў пра наяўнасць пачатковай асветы або навучанне ў даваеннай гімназіі, бо яны згубіліся падчас ваеннай завірухі[730]. Такіх вучняў прымалі ў адпаведныя класы гімназіі з умовай, што цягам месяца яны маюць паказаць добрыя вынікі ў навучанні, інакш будуць пераведзеныя ў ніжэйшыя класы[731].

Вынікі набору вучняў у гімназію дазвалялі яе арганізатарам аптымістычна глядзець у будучыню. Было пададзена больш як 100 заяў, прынята 78 вучняў, у 1922/23 гг. працу пачалі чатыры класы (I, III і IV), а ў наступным годзе адчыніўся II клас. У гімназіі існавалі таксама два падрыхтоўчыя класы, адзін з якіх быў адчынены на прапанову І. Краскоўскага згодна з пастановай педрады ад 13 верасня 1922 г.[732]

Заняткі ў гімназіі пачаліся 18 верасня 1922 г. пасля набажэнства (праваслаўнага – у царкве, каталіцкага – у касцёле)[733]. 3 снежня 1922 г. у будынку гімназіі адбыўся ўрачысты акт адкрыцця ўстановы, у якім узялі ўдзел дырэктар І. Краскоўскі, кіраўнік БША С. Сахараў, інспектар К. Езавітаў і прадстаўнік МЗС Азоліньш. Удзельнікаў тэлеграмамі павіталі: Беларускі пасольскі

[725] LVVA, 2067 f., 1 ap., 367 l., 52 lp.
[726] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 26 lp.
[727] LVVA, 2067 f., 1 ap., 367 l., 38 lp.
[728] LVVA, 2067 f., 1 ap., 367 l., 2 lp.
[729] LVVA, 2067 f., 1 ap., 407 l., 9 lp.
[730] LVVA, 2067 f., 1 apr., 394 l., 175 lp.
[731] LVVA, 2067 f., 1 ap., 367 l., 4 lp.
[732] LVVA, 2067 f., 1 ap., 367 l., 6 lp.
[733] LVVA, 2067 f., 1 ap., 367 l., 4 lp.

клуб у Польскім Сойме, Беларуская школьная рада ў Вільні, Беларуская грамада ў Празе[734].

Напрыканцы 1923 г. Беларускі школьны аддзел разгледзеў магчымасць закрыць малодшы падрыхтоўчы клас і адкрыць яго ў беларускай пачатковай школе ў Даўгаўпілсе. Педрада гімназіі абмеркавала пытанне на пасяджэнні 10 студзеня 1924 г. і зрабіла выснову, што пазбаўленне гімназіі малодшага падрыхтоўчага класа нанесла б шкоду беларускай асвеце, паколькі ён павінен існаваць пры гімназіі да моманту адкрыцця V і VII класаў[735]. У 1925 г. падрыхтоўчы клас усё ж быў перададзены ў склад беларускай пачатковай школы, якая пераехала ў новы мураваны будынак па адрасе *Kauņas iela 98*[736].

Асноўнай крыніцай утрымання гімназіі было ўрадавае фінансаванне, якая прызначалася па лініі Беларускага школьнага аддзела. Памер датацыі Міністэрства асветы складаў ад 1 255 тыс. рублёў (у 1922/23 гг.) да 2 638 (у 1925/26 г.). Дадатковай крыніцай фінансавання былі грошы, сабраныя школьнай радай, а таксама дапамога Культурнага фонду Латвіі. Напрыклад, у 1925/26 гг. з гэтай установы было атрымана 208 латаў, а ў 1926/27 г. – 500 латаў на патрэбы найбяднейшых вучняў. Пэўныя сродкі вылучала гарадское самакіраванне. Даўгаўпілская гарадская ўправа штогод перадавала школе 60 латаў. Гімназія магла разлічваць на падтрымку Даўгаўпілскага гарадскога клубу. Напрыклад, у 1926/27 гг. гэта ўстанова прызначыла гімназіі 40 латаў у межах вучнёўскай стыпендыі імя прэзідэнта Чакстэ. Частку школьнага бюджэту складалі ахвяраванні настаўнікаў, якія аддавалі на гімназію 4% месячнага заробку, што давала каля 800 латаў цягам года. Прыбытак прыносіла выручка з арэнды зямельнага надзела (16,5 га), які належаў гімназіі ў Ілукштанскім павеце і ў ваколіцах Даўгаўпілса. З гэтай крыніцы школа атрымлівала каля 160 латаў у год[737].

Гімназія змагалася з нястачай беларускамоўных падручнікаў. На пасяджэнні 18 кастрычніка 1923 г. педрада канстатавала: "*Большасць вучняў не мае патрэбных падручнікаў, што вельмі шкодна адбіваецца на знаннях вучняў і з'яўляецца труднасцю, асабліва моваў*"[738]. Дзякуючы намаганням кіраўніцтва гімназіі і беларускага актыву, удалося, аднак, часткова вырашыць пытанне. Была створаная школьная бібліятэка, якая ў сярэдзіне 1920-х гг. налічвала 3 314 кніг: на латышскай (960), беларускай (1080), рускай (1005), нямецкай

---

[734] *Гістарычны нарыс пяцігодзьдзя Дзьвінскай Дзяржаўнай Беларускай Гімназіі за 1922–1927 г.г.*, укл.: С. Сахараў, Дзьвінск 1927, с. 36.

[735] LVVA, 2067 f., 1 ap., 367 l., 60 lp.

[736] *Гістарычны нарыс пяцігодзьдзя Дзьвінскай Дзяржаўнай Беларускай Гімназіі за 1922–1927 г.г.*, укл.: С. Сахараў, Дзьвінск 1927, с. 8.

[737] *Гістарычны нарыс пяцігодзьдзя Дзьвінскай Дзяржаўнай Беларускай Гімназіі за 1922–1927 г.г.*, укл.: С. Сахараў, Дзьвінск 1927, с. 28.

[738] LVVA, 2067 f., 1 ap., 367 l., 7 lp.

(181) і іншых (88) мовах. Найбяднейшыя вучні задарма карысталіся падручнікамі, бо не былі ў стане набыць іх уласным коштам[739].

Узроставы, рэлігійны і нацыянальны склад вучняў быў разнастайны. Былая вучаніца гімназіі Людміла Краскоўская згадвала: "*Склад вучняў быў вельмі разнародны – і па ўзросту, і па нацыянальнасці. Напрыклад, у 10-м класе вучыўся А. Махноўскі, які ўжо скончыў Беларускія вучыцельскія курсы, У. Жылка, старэйшы за іншых вучняў. Пераважная большасць навучэнцаў былі беларусы, але ў гімназіі былі і латышы (у 10-м класе – адзін латыш, у 9-м – дзве латышкі, сёстры Рэгут), некалькі расеек, полька Бялінская. У Даўгаўпілсе апрача латышскіх гімназій існавала таксама расейская, якая фінансава была забяспечана лепей, чым беларуская школа. Але ў беларускай гімназіі ніхто не звяртаў увагі на нацыянальную прыналежнасць вучняў, і ўсе жылі дружна*"[740].

Паводле веравызнання ў 1922/23 гг. 50% вучняў складалі праваслаўныя, 42% каталікі, 8% прадстаўнікі іншых веравызнанняў. У пазнейшыя гады канфесійны склад навучэнцаў мала змяніўся, пра што сведчыць табліца.

Табліца 26. Канфесійны склад вучняў у Даўгаўпілскай беларускай гімназіі ў 1922–1927 гг.

Навучальны год	Вучні	Праваслаўныя	Каталікі	Стараверы	Лютэране
1922/23	78	45	31	2	0
1923/24	84	51	30	2	1
1924/25	91	50	37	3	1
1925/26	129	73	52	3	1
1926/27	92	52	37	2	1
Разам	474	271	187	12	4

Крыніца: *Гістарычны нарыс пяцігодзьдзя Дзьвінскай Дзяржаўнай Беларускай Гімназіі за 1922–1927 г.г.,* укл.: С. Сахараў, Дзьвінск 1927, с. 8.

Асобнай увагі заслугоўвае пытанне нацыянальнасці навучэнцаў. У першыя гады нацыянальны склад быў асабліва стракаты. Беларускі крыніцы сведчаць, што ў гімназію падавалі заявы не толькі беларусы, але і прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей[741]. І хоць заканадаўства прадугледжвала прыймо ў гімназію толькі асоб беларускай нацыянальнасці, школьная статыстыка сведчыць пра адваротнае. У першы навучальны год з 90 навучэнцаў беларусы складалі 42. Астатнія былі: 8 латышамі, 5 латгальцамі, 17 рускімі,

[739] *Гістарычны нарыс пяцігодзьдзя Дзьвінскай Дзяржаўнай Беларускай Гімназіі за 1922–1927 г.г.*, укл.: С. Сахараў, Дзьвінск 1927, с. 29.

[740] *Крывіцкія руны*, Вып. I, с. 167.

[741] LVVA, 2067 f., 1 ap., 367 l., 2 lp.

15 палякамі, 2 немцамі і 1 літоўцам. Асабліва шмат небеларусаў вучылася ў двух старэйшых класах. Такая сітуацыя давала нядобразычліўцам магчымасць вінаваціць гімназію ў прымусовай беларусізацыі вучняў-небеларусаў. У сувязі з гэтым, 20–22 верасня 1922 г. адбыліся супольныя нарады кіраўніцтва Даўгаўпілскага аддзела таварыства "Бацькаўшчына", Беларускага школьнага аддзела, Рускага школьнага аддзела і прадстаўнікоў рускай грамадскасці. 21 кастрычніка 1922 г. управа таварыства "Бацькаўшчына" (К. Езавітаў, П. Мядзёлка-Грыб, І. Краскоўскі, У. Корці) прапанавала дазволіць вучням рускай нацыянальнасці скончыць навучанне, стварыўшы два рускія класы, нагляд над якімі меў ажыццяўляць Рускі школьны аддзел. Тым часам, вучняў-беларусаў з III і IV класаў мясцовай рускай гімназіі было прапанавана перавесці ў беларускую гімназію[742].

Табліца 27. Нацыянальны склад вучняў у Даўгаўпілскай беларускай гімназіі ў 1922–1927 гг.

Навучальны год	Вучні	Паступілі новыя	Не скончылі	Скончылі	Латышы	Беларусы	Рускія	Іншыя
1922/23	78	78	3	14	0	70	3	5
1923/24	84	29	2	11	0	74	7	4
1924/25	91	40	5	8	0	76	11	4
1925/26	129	60	13	27	1	124	4	0
1926/27	92	23	4	21	1	84	4	3
Разам	474	230	27	81	2	428	28	16

Крыніца: *Гістарычны нарыс пяцігодзьдзя Дзьвінскай Дзяржаўнай Беларускай Гімназіі за 1922–1927 г.г.,* укл.: С. Сахараў, Дзьвінск 1927, с. 8.

Прысутнасць сярод вучняў небеларусаў абумоўлівалася як нізкім узроўнем нацыянальнай свядомасці славянамоўных жыхароў Латгаліі, так і кан'юнктурнымі памкненнямі. Гэта стварала магчымасці інтэрпрэтацыі нацыянальнасці вучняў. Яскрава сведчаць пра гэта як рашэнні кіраўніцтва гімназіі, так і заявы бацькоў, якія прасілі прыняць або пакінуць іх дзяцей у беларускай гімназіі. На пасяджэнні педрады 16 кастрычніка 1923 г. у школу былі залічаныя Эмілія Мітрас і Эльза Мітрас. Адносна іх нацыянальнасці існавалі сумневы, але педрада вырашыла "*прыняць [у гімназію] умоўна да выяснення пытання аб іх нацыянальнасці*"[743]. Аднак ужо 16 лістапада педрада пастанавіла выключыць іх са школы "*дзеля таго, што нацыянальная прыналежнасць іх да літвіноў не даведзена да гэтага часу дакументальна*"[744]. 19 снежня 1923 г. А. Мадзялеўская ў заяве да кіраўніка гімназіі пісала: "*Прашу*

[742] LVVA, 2125 f., 5 ap., 374 l., 4 lp.; LVVA, 2125 f., 1 ap., 43 l., 80 lp.

[743] LVVA, 2067 f., 1 ap., 367 l., 26 lp.

[744] LVVA, 2067 f., 1 ap., 367 l., 55 lp.

дачку маю Зінаіду Мадзялеўскую заставіць у гімназіі таму, што я лічу сябе беларускай. Тыя абмылкі, якія ёсць у пашпарце наконт нацыянальнасці, я ў скорым часе іспраўлю"[745]. Тым часам, Антон Рышкевіч у звароце да дырэктара гімназіі адзначаў: "*Лічу сябе беларусам і жадаючы, каб мае дзеці вучыліся ў сваёй роднай школе, прашу Вас дапусціць маю доч Рэгіну, 16 лет к іспытам па ўсіх прадметах для паступлення ў I класу беларускай гімназіі і, калі вытрымае, прыняць яе ў гэту класу*"[746]. Здараліся сітуацыі, калі вучняў прымалі ў гімназію пасярэдзіне навучальнага года. Напрыклад, у 1923 г. да кіраўніцтва гімназіі звярнулася дзевяць вучняў, якія прасілі прыняць іх у школу, паколькі яны беларусамі і жадалі вучыцца ў роднай гімназіі. Просьба была задаволеная[747].

Паводле сацыяльнага складу большасцю вучняў была дзецьмі незаможных сялян. У першы год існавання школы іх колькасць дасягала 60% навучэнцаў. І ў сярэдзіне 1920-х гг. 83% вучняў па-ранейшаму складала вясковая моладзь[748]. Што тычыцца месца жыхарства, дык асноўную частку (60%) складалі жыхары Даўгаўпілшчыны. Аднак, пачынаючы з 1925 г., у мурах гімназіі павялічылася колькасць вучняў з Лудзеншчыны, дзе была зачыненая мясцовая беларуская гімназія[749].

Навучанне ў гімназіі было платным. А як матэрыяльнае становішча вучняў было гаротным, дык многія бацькі і вучні прасілі дырэкцыю вызваліць іх ад аплаты за навучанне. Вышэйзгаданая А. Мадзялеўская ў заяве пісала: "*Прашу Школьную Раду звольніць маіх дачок Зінаіду і Вольгу Мадзялеўскіх ад аплаты за вучэнне другога паўгоддзя, дзякуючы таму, што матэрыяльнае становішча маё ў гэтым годзе вельмі кепскае. У гэтым годзе адчыненая мной крама акрамя вельмі вялікіх даўгоў нічога не дала. А заработак майго мужа ўсяго 450 р., з якіх мне прысылае 3000 р., з гэтых грошай я павінна жыць і плаціць даўгі. У такім разе, вельмі прашу Школьную Раду звольніць маіх дачок ад аплаты*"[750]. У верасні 1922 г. К. Езавітаў прасіў кіраўніка БША дапамагчы атрымаць урадавую згоду на абніжэнне коштаў навучання ў гімназіі, бо "*большасць у нас сялянскіх дзетак з вёскі, якім ужо неўмагату пракарміць дзетак у горадзе*"[751]. Аднак памеры аплат рэгуляваліся на агульнадзяржаўным узроўні, што не спрыяла незаможным вучням. Восенню 1923 г. Міністэрства асветы павысіла аплату за навучанне з 200 да 250 рублёў

---

[745] LVVA, 2067 f., 1 ap., 402 l., 5 lp.

[746] LVVA, 2067 f., 1 apr., 405 l., 92 lp.

[747] LVVA, 2067 f., 1 ap., 367 l., 5 lp.

[748] LVVA, 2125 f., 5 ap., 77 l., 15 lp.

[749] *Гістарычны нарыс пяцігодзьдзя Дзьвінскай Дзяржаўнай Беларускай Гімназіі за 1922–1927 г.г.*, укл.: С. Сахараў, Дзьвінск 1927, с. 7–8.

[750] LVVA, 2067 f., 1 ap., 402 l., 21 lp.

[751] LVVA, 2125 f., 5 ap., 38 l., 418 lp.

з магчымасцю вызвалення ад аплаты 25% найбяднейшых вучняў. Гэта, аднак, толькі часткова аблегчыла долю навучэнцаў і іх бацькоў. Некаторыя вучні былі вымушаны часова спыніць навучанне або здаваць пераходныя іспыты ўвосень[752]. У гэтай сітуацыі 29 верасня 1923 г. педрада звярнулася да міністра з просьбай вызваліць ад аплаты большасць вучняў гімназіі[753]. Аналіз крыніц дазваляе зрабіць выснову, што сапраўды многія вучні былі вызвалены ад аплаты[754]. Беднасць вучняў і патрэба ім дапамагаць былі прычынай фінансавых непаразуменняў паміж кіраўніцтвам гімназіі і Міністэрствам асветы. Апошняе вінаваціла кіраўнікоў школы ў безгаспадарчасці і марнаванні бюджэтных сродкаў за 1923–1924 гг.[755]

У сувязі з тым, што значную частку вучняў складалі дзеці незаможных сялян з вёсак, пры гімназіі быў адчынены інтэрнат на 45 месцаў[756]. У 1922–1925 гг. ён знаходзіўся ў будынку на вуліцы Бульварнай, у якім гімназія арандавала 5-пакаёвую бурсу. Кіравалі ёй спачатку С. Салаўёва, а потым Н. Фельдман. Паколькі інтэрнат не меў дастатковых сродкаў на ўтрыманне, яго бюджэт складаўся з прыбытку ад мастацкай дзейнасці вучняў і продажу рамесніцкіх вырабаў[757].

У мурах гімназіі панавала добрая вучнёўская дысцыпліна. Разам з тым, паводзіны некаторых навучэнцаў пакідалі жадаць лепшага. Некаторых юнакоў нават адлічвалі. Напрыклад, 31 кастрычніка 1922 г. педрада гімназіі выкрасліла з вучнёўскага складу вучня Александровіча, які быў арыштаваны палітычнай паліцыяй за распаўсюд камуністычных улётак[758]. У 1924 г. вучань Ігнат Паўлоўскі атрымаў ад іншага навучэнца Іллі Фёдарава віленскую газету "Сын беларуса", прачытаў сам і азнаёміў з ёй вучня Янку Доўгага. Гэта заўважыў настаўнік А. Арлоў, які ў прысутнасці класа абвінаваціў вучня ў тым, што ён на лекцыях "займаецца палітыкай", за што школе можа пагражаць закрыццё. Вучань палічыў гэта абразай і 1 чэрвеня 1924 г. склаў да дырэкцыі скаргу на настаўніка[759].

Аднак выпадкі пакарання за палітычную дзейнасць былі адзінкавыя. Найбольш заўваг выклікала "неакуратная прысутнасць на лекцыях" або

---

[752] LVVA, 2067 f., 1 ap., 367 l., 34 lp.

[753] LVVA, 2067 f., 1 ap., 367 l., 48 lp.

[754] LVVA, 2067 f., 1 ap., 375 l., 12–14 lpp.

[755] LVVA, 2067 f., 1 ap., 375 l., 19–20 lpp.

[756] К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі,* Рыга 1927 [перадрук: Нью Ёрк – Менск 2013], с. 68; У. Ляхоўскі, *Ад гоманаўцаў да гайсакоў. Чыннасць беларускіх маладзёвых арганізацый у 2-й палове XIX ст. – 1-й палове XX ст. (да 1939 г.)*, Смеленск 2015, с. 361.

[757] T. Błaszczak, I. Matiash, D. Michaluk, *Iwan Kraskowski (1880–1955). W służbie Białorusi i Ukrainie*, Białystok 2019, s. 173.

[758] LVVA, 2067 f., 1 ap., 367 l., 8 lp.

[759] LVVA, 4932 f., 1 ap., 626 l., 15 lp.

парушэнне школьнай дысцыпліны. 19 снежня 1922 г. педрада абнізіла адзнаку за паводзіны вучню Якімовічу "*за свіст на лекцыі, самавольны выхад з лекцыі і за вызываючыя манеры трымацца, што сведчыць аб недысцыплінаванасці*". Іншы вучань Язэп Клагіш быў пакараны "за адмову выканання загаду вучыцеля"[760]. Заслугоўвае ўвагі інцыдэнт, звязаны з адхіленнем І. Краскоўскага ад кіравання школай і прызначэннем часовага дырэктара П. Жэрдзі. Падчас вучнёўскага спектакля *На Антокалі* 14 снежня 1924 г. вучні Зыгмунт Мядзёлка і Вольга Бедрава выступілі з куплетамі, змест якіх не быў узгоднены з П. Жэрдзі, адказным за выступ. У сваім вершы яны пажартавалі з новага дырэктара і іншых настаўнікаў[761]. Гэты ўчынак стаў прадметам дыскусіі на пасяджэнні педрады 17 снежня. Меркаванні падзяліліся. П. Жэрдзі патрабаваў пакараць З. Мядзёлку, тлумачачы тым, што яго паводзіны падрывалі аўтарытэт педагогаў гімназіі. Акрамя таго, настаўнік дамагаўся, каб пра здарэнне было паінфармавана Міністэрства асветы, якое мусіла б правесці расследаванне і высветліць, хто стаіць за ўчынкам. Пры гэтым ён даваў зразумець, што лічыць вінаватымі настаўнікаў І. Краскоўскага і П. Мядзёлку-Грыб. Сябры педрады выслухалі тлумачэнне З. Мядзёлкі, які сцвярджаў, што сам напісаў куплеты. Вучань прызнаў, што спяваючы пра старога "дырэктара-бацьку" ён меў на ўвазе І. Краскоўскага, якога шанаваў як заснавальніка гімназіі,

---

[760] LVVA, 2067 f., 1 ap., 367 l., 12 lp.

[761] Два дырэктары ў нас ёсць,
Адзін – бацька, другі – госць.
Адзін ўсюды даглядае,
І да працы нас змушае
З яго рук не ўцячэш.

Бацька з Рыгі нам не страх!
Мы з майстэрняй фіцю-мах!
І пад гул ў нізе матора
(Не было б горшага гора)
Можам мазурку скакаць.

К нам з'явіўся педагог,
А прыгожы-ш, ох-ох-ох!
Як пабачылі дзяўчаты,
Дык зрадзелі, як кацяты –
Будзе з кім нам фліртаваць!

Як пачаў нас вызываць,
З іксам, ігракам гуляць,
Хто найбольш вачмі страляе,
Таму двойкі ў рад стаўляе –
Справядлівасці няма!

а "госцем" лічыў П. Жэрдзі, які, прыступаючы 1 кастрычніка да дырэктарскіх абавязкаў, падкрэсліў, што ён прызначаны на гэтую пасаду часова. Вучань адзначыў, што традыцыю спявання гумарыстычных куплетаў пра сваю школу ён прынёс з Віленскай беларускай гімназіі. Маладзён запэўніваў, што не меў намеру нікога абразіць. Новы кіраўнік гімназіі забараніў вучню з'яўляцца ў будынку школы. Іншыя настаўнікі (Я. Комісарс, П. Мядзёлка-Грыб) лічылі, што такое пакаранне толькі зверне ўвагу на "віноўніка" і зробіць яго героем у вачах аднадумцаў. Настаўнік І. Краскоўскі ўвогуле заклікаў забыцца пра інцыдэнт, каб не ўносіць закалоту ў сяброўскі калектыў педагогаў гімназіі. У выніку сямю галасамі пры двух, якія ўстрымаліся, была прынята рэзалюцыя, у якой адзначалася, што педрада не знайшла ў куплетах элементаў абразы. Аднак, прымаючы пад увагу складаную сітуацыю вакол гімназіі, вырашыла пакараць вучня вымовай[762].

Навучальны працэс у гімназіі быў насычаны. Апрача агульнаадукацыйных ведаў сярэдняй школы выхаванцы гімназіі маглі атрымаць практычныя навыкі, якія рыхтавалі іх да працы. У пачатку 1923/1924 гг. у гімназіі пачалі дзейнічаць электрыфікаваная кузня, дрэваапрацоўчая, сталярна-такарская (для хлопцаў) і кравецка-ткацкая (для дзяўчат) майстэрні. Заняткі ў іх адбываліся ў другой палове дня (16.30–19.00) пад кіраўніцтвам інжынера Яніса Комісарса. Дзейнасць майстэрняў мела некамерцыйны характар. Патрэбу адкрыцця рамесніцкіх майстэрняў абумовіла сялянскае паходжанне вучняў, якія атрымлівалі дадатковую прафесію, што давала б ім кавалак хлеба пасля вяртання ў вёску, бо на дзяржаўнай працы беларусы мелі невялікія шанцы канкураваць з латышамі[763].

На ўтрыманне кузні і майстэрняў з бюджэту Беларускага школьнага аддзела выдаткоўваліся асобныя сродкі. У верасні 1923 г. Рада БША прызначыла 800 латаў на абсталяванне сталярна-такарскай майстэрні; на кравецка-ткацкую – 600 латаў[764]. У першы год існавання гімназіі вучні карысталіся майстэрняй латвійскай рамесніцкай школы, якая месцілася ў тым жа будынку. Аднак, дзякуючы інжынеру Я. Комісарсу, быў распрацаваны праект уласных рамесніцкіх класаў, на стварэнне якіх Міністрэства асветы выдаткавала 12 тыс. латаў. Улетку 1924 г. была абсталявана зала майстэрні. У слясарнай майстэрні былі змантаваныя свідравальны і такарны станкі, ручная пракручальная машына, горан, накавальня, ціскі і іншае абсталяванне. У сталярнай майстэрні быў пастаўлены такарны станок, лентачная піла, круглая піла, дзве стругальныя машыны, фрызерная машына, верстакі і г.д. У кравецка-ткацкай

---

[762] LVVA, 2067 f., 1 ap., 367 l., 87–94 lpp.

[763] T. Błaszczak, I. Matiash, D. Michaluk, *Iwan Kraskowski (1880–1955). W służbie Białorusi i Ukrainie*, Białystok 2019, s. 172.

[764] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 15 lp.

майстэрні былі абсталяваныя два ткацкія станкі з прыладамі (адзін – для простай тканіны, другі – для коўдраў), тры швейныя машыны і адна вязальная. Акрамя кіраўніка Я. Комісарса, майстэрнямі апекаваліся яшчэ тры інструктары. З 1 верасня 1924 г. заняткі ў майстэрнях адбываліся штодзённа. Разам з гімназістамі працавалі вучні беларускай пачатковай школы[765].

Вучні актыўна займаліся фізкультурай. Намаганнямі дырэктара І. Краскоўскага з навучэнцаў гімназіі была створана футбольная дружына, якая з поспехам удзельнічала ў моладзевых спаборніцтвах на Даўгаўпілшчыне[766].

Гімназія была асяродкам культурнага жыцця. У яе мурах быў створаны балалаечны аркестр з 15 асоб (кіраўнік У. Ціхамір аў), які выступаў падчас вечарын[767]. У гімназіі былі два піяніна – вучаніцы практыкаваліся на іх. У гімназіі дзейнічалі творчыя гуркі: літаратурна-гістарычны, мастацкі, фатаграфічны і радыётэхнічны. Асобна варта адзначыць працу вучнёўскага драматычнага гуртка і хору. Працай першага кіравала П. Мядзёлка-Грыб. У рэпертуар хору ўваходзілі беларускія народныя песні са зборніка Уладзіміра Тэраўскага *Беларускі спеўнік з нотамі на тры галасы паводле народных мелодый*, марш *Мы выйдзем шчыльнымі радамі*, латышскія песні, класіка (*Каля хаціны* Станіслава Манюшкі, урыўкі з оперы Бедржыха Сметаны *Праданая нявеста*). З ініцыятывы педагогаў вучні рэгулярна ладзілі тэатральна-мастацкія вечарыны, спектаклі і чытанні. Першы тэатральны выступ адбыўся ўжо з снежня 1922 г., падчас урачыстасці адкрыцця гімназіі. Вучнёўскі калектыў паказаў п'есу *Паўлінка* і балет *Сон у летнюю ноч*[768]. Адной з удзельніц драматычнай трупы была гімназістка Надзея Мікалаева (пазней Мікалаева-Комісар), якая выконвала ролю Паўлінкі ў аднайменнай п'есе Я. Купалы. Таленавітая дзяўчына пазней скончыла Латвійскую кансерваторыю. Выступы драматычнай трупы разглядаліся як камерцыйная праца на карысць гімназіі. Прыбытак з іх прызначаўся на дапамогу найбяднейшым вучням. З гэтай мэтай штогод у гімназіі, а таксама ў гарадскім клубе, ладзіліся вучнёўскія спектаклі, сольныя выступы і спевы хору. Драматычны калектыў выступаў не толькі ў мурах школы, але таксама па вёсках Даўгаўпілшчыны, Лудзеншчыны і Ілукшчыны[769].

---

[765] *Гістарычны нарыс пяцігодзьдзя Дзьвінскай Дзяржаўнай Беларускай Гімназіі за 1922–1927 г.г.*, укл.: С. Сахараў, Дзьвінск 1927, с. 17–22.

[766] У. Ляхоўскі, *Ад гоманаўцаў да гайсакоў. Чыннасць беларускіх маладзёвых арганізацый у 2-й палове XIX ст. – 1-й палове XX ст. (да 1939 г.)*, Смеленск 2015, с. 361–362; *Крывіцкія руны. Вып. II: Беларускі культурны мацярык у Латвіі*, рэд. М. Казлоўскі, С. Панізнік, Менск 2017, с. 289–290.

[767] LVVA, 2067 f., 1 ap., 375 l., 10 lp.

[768] *Гістарычны нарыс пяцігодзьдзя Дзьвінскай Дзяржаўнай Беларускай Гімназіі за 1922–1927 г.г.,* укл.: С. Сахараў, Дзьвінск 1927, с. 36.

[769] *Гістарычны нарыс пяцігодзьдзя Дзьвінскай Дзяржаўнай Беларускай Гімназіі за 1922–1927 г.г.*, укл.: С. Сахараў, Дзьвінск 1927, с. 15.

12 лютага 1924 г. з дапамогай Беларускага школьнага аддзела вучні наведалі Рыгу. Па запрашэнні міністра асветы Я. Райніса трупа і хор гімназіі выступілі на сцэне Нацыянальнага тэатра оперы і балета. Вучнёўскі тэатральны гурток паказаў *Паўлінкі*, а потым хор выконваў беларускія песні[770].

Вучаніца Людміла Краскоўская наступным чынам згадвала мастацкую дзейнасць у мурах гімназіі і па-за імі: "*Навучанне ў гімназіі хутка наладзілася і ішло нармальна, разам з вучобаю развівалася самадзейная праца: быў арганізаваны хор з вучняў і драматычны гурток. Заняткі праводзіла Паўліна Мядзёлка, якая аддавала хору і гуртку ўсе свае здольнасці. На другім паверсе будынка гімназіі была вялікая зала, дзе пабудавалі сцэну, там стаяла і піяніна. Пасля заканчэння ўрокаў у другой палове дня дзейнасць вучняў пераносілася ў гэтую залу. Рабіліся рэпетыцыі драматычных пастановак, праходзілі спеўкі хору. Падчас гэтых прац вельмі памагала жонка У. Пігулеўскага – Вольга Бароўская. Яна была выдатная піяністка і брала ўдзел у рэпетыцыях і выступленнях. Зімою 1923 года хор Беларускай гімназіі паехаў у Рыгу, дзе выступаў у Дзяржаўным тэатры. Гэта была заслуга латышскага паэта Яна Райніса, які ўвесь час падтрымліваў беларускія справы. Ён тады быў міністрам адукацыі ў Латвіі і пастараўся, каб хор Беларускай гімназіі ў Даўгаўпілсе паклікалі да Рыгі. Выступленне хору ў Рызе мела поспех. Пасля заканчэння спеву хор разам з Я. Райнісам сфатаграфавалі на сцэне тэатра. Першай пастаноўкай драматычнага гуртка, якую падрыхтавала П. Мядзёлка, была 'Паўлінка' Янкі Купалы. Пазней ставілі кароткую сцэну 'На першай гульні' і балет на каўказскія матывы. Я пераклала з чэшскай мовы аперэту 'З чэшскіх млыноў', якая таксама мела поспех. Кожны раз, калі было выступленне хору альбо гралі якуюсь п'есу, зала была поўная гледачоў, некаторыя пастаноўкі паўтаралі два разы. Салісткай была Надзя Мікалаева, якая прыгожа спявала і добра іграла. Добра спявала і другая вучаніца – Анка Бедарава. Дэкарацыі для пастановак рабілі самадзейна. Малявалі іх вучні: я і Пётра Мірановіч, трохі дапамагаў Сенька Дарафееў. Майстэрні сапраўды вельмі дапамагалі пры пастаноўках: у швейнай дзяўчаты пасшывалі вялікія палотны для дэкарацый, у сталярнай хлопцы выраблялі розныя дэталі для абсталявання сцэны. Агулам, гэтая мастацкая дзейнасць вельмі яднала цэлы калектыў гімназіі, настаўнікаў і вучняў*"[771].

Такім чынам бачна, што, нягледзячы на матэрыяльныя цяжкасці, вучнёўскае жыццё гімназіі хутка набрала тэмп. Вось якім чынам апісвала той час настаўніца П. Мядзёлка-Грыб: "*З ранку да позняга вечара жыццё кіпела ў будынку гімназіі. Пасля ўрокаў і абедзеннага перапынку зноў вучні беглі*

---

[770] LVVA, 2067 f., 1 ap., 367 l., 64 lp.; *Гістарычны нарыс пяцігодзьдзя Дзьвінскай Дзяржаўнай Беларускай Гімназіі за 1922–1927 г.г.*, укл.: С. Сахараў, Дзьвінск 1927, с. 36.

[771] *Крывіцкія руны*, Вып. I, с. 167.

ў гімназію: хто ў майстэрню, хто на рэпетыцыю. Унізе гул матораў, стук малаткоў па кавадлах, грукат швейных машын, лязг кроснаў, а наверсе песні, мастацкая гімнастыка або рэпетыцыя п'есы"[772].

Кіраўніцтва гімназіі надавала значную ўвагу пазашкольнай працы. Яно намагалася падтрымліваць сувязь паміж гімназіяй і вёскай, каб уздымаць нацыянальную свядомасць апошняй. З гэтай мэтай ладзіліся школьныя экскурсіі па Латгаліі, выступы і лекцыі для сялян на Даўгаўпілшчыне і Лудзеншчыне. Гімназія мела ў сваім распараджэнні кінапраектар Pathé Kok, якое выкарыстоўвалася для сеансаў у гімназіі і падчас вандровак па вёсках[773]. У мурах гімназіі адзначаліся латвійскія святы, у першую чаргу Дзень Незалежнасці. У 1923 г. яго праграма выглядала наступным чынам: 1) прывітальнае слова дырэктара і дзяржаўны гімн, 2) прамова настаўніка В. Зінкевіча на латышскай мове аб значэнні свята, 3) рэферат настаўніка У. Пігулеўскага, 4) дэкламацыя вершаў, 5) спевы латышскіх песняў у выкананні вучнёўскага хору[774].

Асобнай згадкі заслугоўвае дзейнасць беларускага скаўцкага руху ў Даўгаўпілскай гімназіі. Да ўзнікнення і развіцця мясцовага скаўтынгу спрычыніўся дырэктар І. Краскоўскі, які ў кастрычніку 1922 г. стварыў пры гімназіі 45-ы аддзел скаўтаў. Апошні падначальваўся Латвійскай скаўцкай цэнтральнай арганізацыі[775]. 23 красавіка 1923 г. аддзел узяў удзел у агульналатвійскім скаўцкім парадзе ў Рызе. Падчас урачыстасці прэзідэнт краіны ўручыў беларускім скаўтам штандар з выявай шчыта беларускіх нацыянальных колераў. На наступны дзень штандар быў прывезены ў Даўгаўпілс і змешчаны ў будынку гімназіі[776]. 31 жніўня – 3 верасня 1923 г. беларускія скаўты зноў наведалі сталіцу Латвіі, дзе ўзялі ўдзел у агульналатвійскім скаўцкім сходзе[777]. Акрамя ўласнага штандара беларускія скаўты мелі адзнаку на рукаве ў выглядзе бела-чырвона-белага шчыта[778]. Беларускія даўгаўпілскія скаўты прымалі прысягу словамі: "*Ганаровым словам абяцаюся ўсімі сіламі старацца выканаць свой абавязак перад Богам, Бацькаўшчынай і Латвійскім урадам, памагаць блізкім сваім і ў кожны час выканаць законы скаўтаў*"[779]. Гісторыя дала магчымасць даўгаўпілскім скаўтам пацвердзіць

---

[772] П. Мядзёлка, *Сцежкамі жыцця*, Менск 2018, с. 326.

[773] *Гістарычны нарыс пяцігодзьдзя Дзьвінскай Дзяржаўнай Беларускай Гімназіі за 1922–1927 г.г.*, укл.: С. Сахараў, Дзьвінск 1927, с. 29.

[774] LVVA, 2067 f., 1 ap., 367 l., 54 lp.

[775] LVVA, 2125 f., 5 apr., 428 l., 38 lp.

[776] *У Латвіі,* "Крывіч" 1923, № 1, с. 59; "Беларускі студэнт" 1923, № 4–5, с. 17.

[777] LVVA, 2125 f., 5 apr., 428 l., 38 lp.

[778] LVVA, 2125 f., 5 apr., 428 l., 23 lp.

[779] LVVA, 2125 f., 5 ap., 428 l., 19 lp.

тыя словы справай. Увесну 1924 г. у Даўгаўпілсе здарылася вялікая паводка, рака прарвала дамбы і затапіла частку горада. Беларускія скаўты далучыліся да ратавання жыхароў і іх маёмасці[780].

Першы выпуск у Даўгаўпілскай беларускай гімназіі адбыўся ў 1922/23 гг., калі яе муры пакінула 14 асоб. У наступным навучальным годзе (1923/24 гг.) гімназію скончыла 11 навучэнцаў. Праз год (1924/25 гг.) атэстаты сталасці атрымала 8 юнакоў і дзяўчат. У першых трох выпусках былі маладыя латгальскія беларусы, якія потым чынна ўключыліся ў мясцовае беларускае нацыянальнае жыццё. Сярод іх можна ўзгадаць Яна Карнавухава, Алеся Махноўскага, Паўла Пырсікава. Яны плённа працавалі на беларускай ніве ў міжваеннай Латвіі[781]. Такім чынам, гімназія з'яўлялася галоўнай кузняй нацыянальнай інтэлігенцыі ў перыяд, калі беларускі рух у Латвіі рабіў першыя крокі.

Лудзенская дзяржаўная беларуская гімназія (*Ludzas Valsts baltkrievu vidusskola*). Даўгаўпілская гімназія была ў стане забяспечыць адукацыйныя патрэбы адной толькі Даўгаўпілшчыны. Беларускі актыў не мог задаволіцца існаваннем у Латгаліі толькі адной сярэдняй школы. Беларускія дзеячы рабілі спробы адкрыць яшчэ адну на тэрыторыі Лудзенскага павета. 20 красавіка 1922 г. К. Езавітаў узняў па пасяджэнні Рады БША пытанне пра стварэнне гімназіі ў Лудзы[782]. 9 траўня 1922 г. Беларускі школьны аддзел звярнуўся да міністра асветы з просьбай дазволіць адчыніць там школу. У выніку 24 траўня 1922 г. міністр асветы даў дазвол таварыству "Бацькаўшчына" арганізаваць прыватную беларускую сярэднюю школу ў Лудзы[783]. 15 ліпеня 1922 г. Рада БША ўхваліла рашэнне аб адкрыцці беларускай сярэдняй школы таварыства "Бацькаўшчына". Было вырашана выдаткаваць на гэтую патрэбу 200 тыс. рублёў[784]. Аднак беларусы не паразумеліся з мясцовым самакіраваннем. 5 ліпеня 1922 г. Лудзенская гарадская дума адмовілася даць Беларускаму школьнаму аддзелу дапамогу на арганізацыю беларускай гімназіі. Адмову радныя матывавалі тым, што просьба з'явілася тады, калі гарадскі бюджэт быў ужо зацверджаны. Узамен дума прапанавала вылучыць пэўныя сродкі з лішкаў бюджэту і дазволіць карыстацца будынкам мясцовай рускай школы пры ўмове, што заняткі ў беларускай школе будуць адбывацца па-руску, а прадметы па гісторыі і геаграфіі Беларусі і беларускай мове будуць

---

[780] *Крывіцкія руны,* Вып. I, с. 168.

[781] *К 5-ці гадоваму юбілею Дзьвінскай дзяржаўнай беларускай гімназіі*, "Школьная праца" 1926, № 6.

[782] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 10 lp.

[783] LVVA, 2125 f., 5 ap., 374 l., 13 lp.

[784] LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 4 lp.

неабавязковыя для вучняў-небеларусаў. Акрамя таго, хрысціянскія дзеці мусілі прымацца ў гімназію незалежна ад нацыянальнасці[785].

Кіраўніцтва таварыства "Бацькаўшчына" не пагадзілася на гэтыя ўмовы і вырашыла адчыніць прагімназію замест гімназіі, што патрабавала меншых выдаткаў. 1 верасня 1922 г. адбылася ўрачыстасць адкрыцця 6-гадовай беларускай прыватнай прагімназіі таварыства "Бацькаўшчына". Установа месцілася ў доме на вуліцы Астроўскай 22. Будынак належыў Іцыку Ісьеміну, з якім таварыства "Бацькаўшчына" яшчэ 2 лютага 1922 г. заключыла дамову найму на год[786]. Дырэктарам быў прызначаны Аляксей Арлоў[787]. Заняткі ў прагімназіі пачаліся 15 верасня 1922 г. На пачатку працавалі толькі два класы, у якіх налічвалася 58 вучняў, у тым ліку 35 беларусаў, 10 рускіх, 9 палякаў, 3 латышы і 1 літовец[788]. З прычыны адсутнасці ў Лудзы дастатковай колькасці педагогаў з веданнем беларускай мовы, многія ўрокі ішлі па-руску. У снежні 1922 г. Беларускі школьны аддзел звярнуўся да дырэктара Даўгаўпілскай беларускай гімназіі І. Краскоўскага з просьбай адкамандзіраваць у Лудзу аднаго з настаўнікаў беларусазнаўства[789].

З'яўленне беларускай прагімназіі выклікала незадаволенасць мясцовых рускіх і латгальскіх дзеячаў. 11 лістапада 1922 г. Рада Рускага школьнага аддзела прыняла рашэнне падрыхтаваць зварот да міністра асветы з прапановай ператварыць беларускую ўстанову ў руска-беларускую ў падпарадкаванні Рускага школьнага аддзела. Удзел Беларускага школьнага аддзела абмяжоўваўся да нагляду за выкладаннем беларускай мовы ў беларускіх класах[790]. 1 лютага 1923 г. на старонках выдання "Jaunākās Ziņas" (№ 25) пабачыў свет артыкул дэпутата Францiса Кэмпса пад назвай *Еще про латвийских белоруссов*, у якім аўтар сцвярджаў, што "Лудзенская гімназія складалася з вялікаросаў, габрэяў, латгальцаў і некалькіх беларусаў". Акрамя таго, палітык пераконваў, што ў мурах беларускай прагімназіі адбываюцца камуністычныя выступленні з выкарыстаннем чырвоных сцяжкоў. Аўтар абвінавачваў кіраўніцтва школы ў тым, што яно прымае моладзь прызыўнога веку. Кэмпс пісаў таксама, што беларусы выдаюць стыпендыі "беларусам габрэйскага паходжання ў нейкі Славянскі ўніверсітэт". Аўтар звяртаў увагу, што ў беларускіх школах пануе руская мова. 2 лютага 1923 г. на гэтую публікацыю зрэагаваў К. Езавітаў, які звярнуўся ў рэдакцыю газеты з просьбай апублікаваць яго адкрыты ліст да

---

785 НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 107, л. 44–45; LVVA, 2125 f., 5 ap., 247 l., 14 lp.; LVVA, 2125 f., 5 ap., 374 l., 6 lp.

786 LVVA, 2125 f., 5 ap., 247 l., 32 lp.; LVVA, 2125 f., 5 ap., 247 l., 103 lp.

787 LVVA, 5213 f., apr. 16, 16514 l., 3 lp.

788 НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 110, л. 4; LVVA, 2125 f., 5 ap., 105 l., 90 lp.

789 LVVA, 2125 f., 5 ap., 69 l., 105 lp.

790 LVVA, 2125 f., 1 ap., 43 l., 99 lp.

Ф. Кэмпса. 8 лютага 1923 г. у рэдакцыю звярнулася кіраўніцтва БША патрабуючы выпраўлення інфармацыі латгальскага палітыка. Выкарыстанне рускай мовы ў навучанні Беларускі школьны аддзел тлумачыў часовым пераходным становішчам, якое было ўласціва і школам іншых нацыянальнасцей. Кіраўніцтва БША лічыла заявы Ф. Кэмпса праявай вузкага нацыяналізму і выказвала надзею, што латышскі народ, які сам быў прыгнечаны, не будзе мірыцца з шавінізмам у дачыненні да беларусаў[791].

Напады на прагімназію з боку нядобразычліўцаў не спынілі працэсу разбудовы беларускіх сярэдніх школ. 22 красавіка 1923 г. Рада Беларускага школьнага аддзела прыняла рашэнне ператварыць прыватную прагімназію ў дзяржаўную гімназію, якую магла б наведваць беларуская моладзь як Лудзенскага, так і Рэжыцкага паветаў[792]. Раней, 1 красавіка 1923 г., К. Езавітаву было даручана стварэнне гімназіі[793]. Захады беларусаў далі плён, і 1 жніўня 1923 г. прыватная прагімназія была ператвораная ў 2-ю Лудзенскую дзяржаўную беларускую гімназію (*Valsts 2. Ludzas baltkrievu vidusskola*), а К. Езавітаў зацверджаны на пасадзе яе дырэктара. У жніўні 1923 г. быў прыняты статут установы[794].

Матэрыяльнае становішча школы было складаным. Кіраўнік гімназіі мусіў забяспечыць яе мэбляй і матэрыяламі. Маштаб працы дазваляе ўявіць яго ліст у Беларускі школьны аддзел: "*Мушу ўказаць тутака, што мне якраз прыйшлося прарабіць шмат арганізацыйнай працы, пачынаючы з загатоўкі ўсяго школьнага інвентару, прычым прыходзілася самому не толькі даглядаць за працай і прыёмкай, але вычэрчываць усе планы і вылічваць размеры партаў, шкафоў, сталоў, класных дошак, гімнастычных прыбораў і іншага, ды канчаючы беганінай па рыжскіх магазінах у шуканні пасобіяў, кніг для бібліятэкі, малюнкаў, прыбораў для фізічнага і хімічнага кабінетаў, карт, мадэляў, арнаментаў і іншага, не кажучы ўжо аб працы, праробленай над адшуканнем спосабаў атрымаць для гімназіі лепшае і больш выгаднае памешканне*"[795]. Праз нястачу сродкаў гімназія мусіла арандаваць плошчы ў трох будынках у розных раёнах Лудзы. Тры класы і настаўніцкі пакой знаходзіліся на 2-м паверсе ў будынку на вуліцы Себежскай, 66. Гімнастычная зала месцілася ў будынку на рагу вуліц Аляксандраўскай і Доктарскай. Канцылярыя гімназіі спачатку кватаравала на вуліцы Пушкінскай, 13, а потым была перанесеная ў суседні будынак з гімназіяй на вуліцу Себежскую, 64. У выніку

---

[791] LVVA, 2125 f., 5 ap., 105 l., 20 lp.

[792] LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 81 lp.

[793] LVVA, 5213 f., apr. 16, 16514 l., 3 lp.

[794] *У Латвіі*, "Крывіч" 1923, № 1, с. 59; НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 110, л. 16; LVVA, 1612 f., 14 apr., 11 l., 24 lp.

[795] LVVA, 4932 f., 1 ap., 617 l., 6 lp.

кіраўнік мусіў знаходзіцца ў сталым руху, каб быць прысутным і ў канцылярыі, і ў будынку, дзе адбываліся заняткі[796].

У першы год існавання школы ў ёй працавалі: Кастусь Езавітаў, Рыгор Плыгаўка, Аляксей Арлоў, Уладзімір Пігулеўскі, Аляксандр Шкульцін. Педагогі былі рознай нацыянальнасці. У 1923/24 гг. у гімназіі навучалі: беларусы К. Езавітаў, А. Арлоў, Аляксандр Мекш, Міхал Іваноў, Р. Плыгаўка, Сяргей Казека і а. Феафан Барысовіч; рускі Ніктапаліён Талоцкі; літовец кс. Ігнат Дэкснес; праваслаўны латыш Пётр Мурніек; паляк Аляксей Гадлеўскі; немка Манда Арлова[797]. Не ўсе настаўнікі ведалі беларускую мову. У выніку толькі частка прадметаў выкладалася па-беларуску: гісторыя Беларусі, славянаznаўства, гімнастыка (К. Езавітаў), беларуская мова, гісторыя беларускай літаратуры, геаграфія Беларусі і ўсеагульная геаграфія (С. Казека, класны кіраўнік II класаў), спевы (М. Іваноў), геаметрыя і алгебра (Р. Плыгаўка). Астатнія прадметы вывучаліся па-руску. Але і на гэтых занятках вучні маглі адказваць на беларускай мове, а таксама выкарыстоўваліся беларускамоўныя падручнікі. Кіраўніцтва гімназіі планавала перавесці на беларускую мову ў 1924/25 гг. наступныя прадметы: агульную гісторыю, лаціну ў I і II класах (А. Арлоў), лаціну ў III класе (Н. Талоцкі), фізіку і прыродаznаўства (А. Мекш). Пераход іншых прадметаў на беларускую мову замарудзіўся з прычыны адсутнасці падручнікаў (прыродаznаўства ў I і II класах, матэматыка ў III класе, нямецкая мова, лаціна)[798].

Праграма вывучэння роднай мовы выглядала наступным чынам: у I класе вучні атрымлівалі першасныя веды, у II – знаёміліся з прыёмамі вершаскладання, сістэматычнага вывучэння тэорыі мовы, у III – вывучалі гісторыю беларускай літаратуры з пачатку існавання да канца XVIII ст., а ў апошнім – вывучалі гісторыю беларускай літаратуры ў мадэрны перыяд[799]. Каб прыспешыць пераход на беларускую мову, К. Езавітаў у 1923 г. прапанаваў Міністэрству асветы ўзяць на працу двух настаўнікаў без латвійскага грамадзянства: Сцяпана Сіцько і Яўгена Багдановіча. Аднак ініцыятыва не знайшла разумення і 12 верасня 1923 г. ім не далі дазволу працаваць у Лудзы[800]. Не спрыяў пашырэнню ў гімназіі беларускай мовы факт, што ў кастрычніку 1923 г. школьная рада вырашыла паменшыць колькасць гадзін яе вывучэння (з 4 да 2 гадзін у тыдзень ва ўсіх класах) з адначасовым павелічэннем

[796] LVVA, 4932 f., 1 ap., 617 l., 5 lp.

[797] LVVA, 2125 f., 5 ap., 259 l. 20 lp.; LVVA, 2125 f., 5 ap., 155 l. 15 lp.

[798] LVVA, 4932 f., 1 ap., 617 l., 5–7 lpp.

[799] Д. Крэнт, *Матэрыялы Цэнтра даследаванняў старадрукаваных кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі як крыніца па гісторыі беларускага нацыянальна-культурнага жыцця ў Латвіі ў 1920–1930-ыя гг.*, "Латыши и беларусы: вместе сквозь века" 2023, № 13, с. 118–119.

[800] LVVA, 4932 f., 1 ap., 617 l., 8 lp.

колькасьці гадзін вывучэння рускай мовы (у пачатковым класе: з 2 да 3, у 1–4 класах – з 3 да 4)[801]. Акрамя агульнаадукацыйных ведаў вучні атрымлівалі прафесійную падрыхтоўку. У гімназіі працавалі майстэрні: сталярная (для хлопцаў) і кравецкая (для дзяўчат). У верасні 1923 г. Рада БША прызначыла на іх утрыманне адпаведна 800 і 600 латаў (200 – на пераплёты, 400 – на кройку і шыццё)[802].

Вучылася ў гімназіі моладзь з Лудзеншчыны. Улетку 1923 г. кіраўнік выдаў адозву, інфармуючы насельніцтва пра стварэнне ўстановы і заахвочваючы сялян аддаваць у яе сваіх дзетак[803]. 26 чэрвеня 1923 г. ён падрыхтаваў інструкцыю-брашуру "Што трэба ведаць вучню паступаючаму ў 2-ю Урадавую беларускую Гімназію ў Лудзы"[804]. У 1923/24 гг. адчыніліся два малодшыя класы, а ў наступным працавалі чатыры[805]. Яшчэ ў траўні 1923 г. К. Езавітаў прасіў у Беларускага школьнага аддзела дазволу стварыць падрыхтоўчы клас, каб выпускнікі 4-класных беларускіх пачатковых школ Лудзеншчыны (яны складалі большасць у павеце) маглі паступіць у гімназію[806].

У спісе вучняў Лудзенскай гімназіі ў 1922/23 гг. налічвалася 56 вучняў, у 1923/24 – 80, у 1924/25 – 45[807]. Паколькі значная частка вучняў паходзіла з вёсак, пры гімназіі быў створаны інтэрнат. Паводле веравызнання навучэнцы належалі да розных канфесій. У два апошнія гады існавання школы яе наведвала 59 праваслаўных, 44 каталікі і 1 старавер. Нацыянальны склад навучэнцаў выглядаў наступным чынам: беларусы – 84, рускія – 11, палякі – 3, літовец – 1, латыш – 1. Нацыянальнасць астатніх вучняў была нявызначаная[808]. Ёсць падставы меркаваць, што нацыянальная статыстыка навучэнцаў была недакладнай. Сведчаць пра гэта выпадкі змены нацыянальнасці ў асабістых справах вучняў. Напрыклад, 24 сакавіка 1923 г. бацька аднаго з вучняў Мікалай Шышко звярнуў увагу кіраўніка гімназіі на тое, што яго сын Мікалай быў запісаны "вялікарусам", што не адпавядала праўдзе, паколькі сям'я Шышкаў лічыць сябе беларусамі і паходзіла з Невельшчыны былой Віцебскай губерні[809].

Сацыяльны склад вучняў гімназіі не адрозніваўся ад складу навучэнцаў іншых беларускіх школ. Гэта былі дзеці незаможных сялян, што абумовіла цяжкасці з аплатай за навучанне. Бацькі вучняў нярэдка звярталіся да

---

[801] LVVA, 2125 f., 5 ap., 155 l., 50 lp.

[802] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 15 lp.

[803] LVVA, 4932 f., 1 ap., 624 l., 70 lp.

[804] LVVA, 4932 f., 1 ap., 611 l., 1–3 lpp.

[805] К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, Рыга 1927 [перадрук: Нью-Ёрк – Менск 2013], с. 95.

[806] LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 94 lp.

[807] LVVA, 2125 f., 5 ap., 259 l.

[808] Падлік на падставе: LVVA, 4932 f., 1 ap., 620 l., 2–16 lp.

[809] LVVA, 4932 f., 1 ap., 627 l., 138 lp.

кіраўніка гімназіі з просьбамі вызваліць іх дзетак ад аплаты за навучанне або адтэрмінаваць яе[810]. Вось што пісаў вучань Міхась Калінін (14 лістапада 1923 г.) у лісце кіраўніцтву гімназіі: "*Бацька, атрымаючы 5700 рублёў у месяц жалавання, павінен: пракарміць, апрануць дзевяць душ сям'і, не мае нічога акрамя халупіны. Да 31 студзеня 1923 г. трэба заплаціць бацьку ўрадавы хатні налог 1270 рублёў, і ўсё гэта з жалавання. Увіду трудных матэрыяльных абстаяцельстваў бацькі адказаліся памагаць мне – прадалжаць абразаванне, бо ў іх ёсць яшчэ дзеці, якім трэба даць хаця меленькую падгатоўку к жыццю. Пагэтаму я павінен абы-як зарабляць, каб мець магчымасць: апрануцца, купіць вучнёўскія рэчы і іншае. Шчыра прашу педагагічную раду, калі ёсць магчымасць, памагчы мне – зволіць ад аплаты за вучэнне ў 1923–1924 годзе*"[811]. Можна таксама прывесці заяву вучаніцы Сафіі Доўгай (красавік 1924 г.), якая пісала: "*Прашу Школьную Раду даць мне адсрочку за ўплату за другі паўгодак, таму што мой мужык Браніслаў Доўгі ў гэты час астаўся ад службы і цяпер пераехаў на службу ў м. Даўгаўпілс. Жывём мы толькі на то, што палучае мой мужык, а грошы якія зарабіў ён на старой службе, могуць хваціць нам толькі на прапітанне да таго часу, калі мой мужык палучыць жалаванне на новай службе. Гэтым маю гонар прасіць Школьную Раду даць мне адсрочку*"[812]. У сваю чаргу настаўніца Зілупскай беларускай пачатковай школы (2 лютага 1924 г.) прасіла кіраўніцтва Лудзенскай гімназіі: "*Ні маючы: ні бацькі, ні ўласнай гаспадаркі, я павінна ўласнай працай дапамагаць сваёй сястры вучыцца; да гэтага часу я з астатніх сіл уносіла грошы за права навучання, але зараз, калі я маю яшчэ адзін абавязак, лячыць хворую матку, я больш не маю магчымасці гэта рабіць. Дзякуючы благому сучаснаму становішчу, я прымушана прасіць Педагагічную Раду Люцынскай II Дзярж. Беларускай Гімназіі звольніць маю сястру Валянтыну Казлоўскую ад аплаты за права навучэньня 1923–24 вуч. года. Маю надзею што Педагагічная Рада зрадумее маё становішча й дапаможа працягнуць асвету маёй сястры*"[813].

Ведаючы цяжкае матэрыяльнае становішча бацькоў і вучняў, кіраўніцтва гімназіі ішло насустрач іх просьбам. Напрыклад, 19 сакавіка 1924 г. школьная рада гімназіі вызваліла вышэйзгаданую Валянціну Казлоўскую ад аплаты за 2-е паўгоддзе 1923/24 гг. У 1923/24 гг. з 71 вучня 15 былі вызваленыя ад аплаты, а яшчэ 15 атрымлівала стыпендыі. Такім чынам, 42,25% вучняў гімназіі ў той ці іншай форме не плаціла за навучанне[814].

---

[810] LVVA, 4932 f., 1 ap., 623 l., 172 lp.
[811] LVVA, 4932 f., 1 ap., 624 l., 10 lp.
[812] LVVA, 4932 f., 1 ap., 623 l., 202 lp.
[813] LVVA, 4932 f., 1 ap., 624 l., 72 lp.
[814] LVVA, 4932 f., 1 ap., 617 l., 4 lp.

Не захавалася шмат звестак пра вучнёўскую дысцыпліну ў Лудзенскай гімназіі. На падставе нешматлікіх крыніц можна зрабіць выснову, што ў яе мурах здараліся асобныя інцыдэнты. Напрыклад, у красавіку 1924 г. вучань Бычкоўскі параніў стрэлам з рэвальвера іншага вучня – Грыгор'ева[815].

З моманту ператварэння прыватнай прагімназіі ў дзяржаўную гімназію асноўнай крыніцай утрымання ўстановы з'яўлялася дзяржаўнае фінансаванне па лініі Беларускага школьнага аддзела. Дадатковай крыніцай быў прыбытак з культурнай дзейнасці[816]. Кіраўнік гімназіі звяртаў увагу на недафінансаванне школы, падкрэсліваючы, што ў 1922 г. Беларускі школьны аддзел прызначыў Лудзенскай гімназіі толькі 200 тыс. рублёў, а Даўгаўпілскай – ажно 800 тыс. Як пісаў К. Езавітаў: "*Не дзіўна, што Дзвінск змог згуртаваць сілы і належна абстанавіць гімназію, у той час, калі Лудза ледзьве, як кажуць, дыхала. І трэба дзівіцца не таму, што здолеў развярнуць Дзвінскі Беларускі цэнтр, а шчыра дзівіцца таму, як змог 'утрымацца' Люцын*"[817].

Выхаванцы лудзенскай гімназіі намагаліся не адставаць ад калегаў з Даўгаўпілса ў справе нацыянальна-культурнага жыцця. З ініцыятывы К. Езавітава сярод вучняў быў створаны культурна-асветны гурток "Лепшая доля", які меў тры секцыі: літаратурна-выдавецкую, тэатральна-мастацкую і гістарычна-этнаграфічную. На пачатку 1923/24 гг. у мурах гімназіі адбылася выстава вучнёўскіх малюнкаў. Пад наглядам настаўнікаў Данілы Казлоўскага, Міколы Талеркі, Язэпа Камаржынскага і іншых вучні ладзілі спектаклі для моладзі і дарослых, праводзілі чытанні. З канца 1922 г. працавала самадзейная драматычная дружына, якой кіравалі спачатку Сяргей Казека, потым К. Езавітаў і настаўніца латышскай мовы Шміт. Дырэктар К. Езавітаў адзначаў, што лудзенцы зладзілі менш тэатральных выступаў, чым іх даўгаўпілскія аднагодкі. Аднак яны пераўзышлі апошніх па памеры выручкі з тэатральнай дзейнасці. Сярод найбольш таленавітых выступоўцаў былі вучні Янка Доўгі, Юзэфа Васілеўская, Валянціна Казлоўская, Іпаліт Паўлоўскі, Ян Кудраўцоў, літоўка Кацярына Мікалюнас[818]. Апошняя выконвала ролю Паўлінкі ў аднайменнай п'есе Я. Купалы. Адна з тэатральных імпрэз у мурах гімназіі адбылася 29 красавіка 1923 г. Вучні гралі вышэйзгаданую п'есу, якую рэжысіраваў С. Казека, а хорам кіраваў М. Іваноў. Дзякуючы вечарыне, гімназія зарабіла 11 тыс. рублёў[819].

---

[815] LVVA, 4932 f., 1 ap., 623 l., 30 lp.

[816] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 15 lp.

[817] LVVA, 2125 f., 5 ap., 105 l., 20 lp.

[818] К. Езавітаў, *Спробы беларускага нацыянальнага тэатру ў Латвіі*, "Голас беларуса" 1925, № 2 ад 20 чэрвеня, с. 2.

[819] "Беларускі студэнт" 1923, № 4–5, с. 17.

Вучнёўская моладзь актыўна ўдзельнічала ў культурнай працы на правінцыі. 20–22 траўня 1923 г. вучні гімназіі пад кіраўніцтвам К. Езавітава зладзілі экскурсію ў Зілупе і двор Залессе. Падчас вандроўкі драматычная дружына гімназістаў (кіраўнік С. Казека) паставіла п'есу *Паўлінка*. Апрача таго, адбыліся канцэрты вучнёўскага хору, выступы аркестру, паказы гімнастычных практыкаванняў і гульняў з удзелам скаўтаў і гайдаў гімназіі супольна з вучнямі мясцовых беларускіх школ. Паводле К. Езавітава, вандроўкі па вёсках заахвочвалі беларускую моладзь да самастойнай арганізацыі падчас канікулаў беларускіх імпрэз і спектакляў. Вялікае ажыўленне па вёсках Лудзенскага павета выклікала паходнае кіно, з якім вандраваў вучань Пятро Масальскі[820].

Некаторыя вучні праяўлялі літаратурныя здольнасці. У сувязі з гэтым дырэктар К. Езавітаў вырашыў апублікаваць вынікі іх працы. Ён адабраў найлепшыя творы, а вучні заняліся тэхнічным бокам падрыхтоўкі да выдання. У 1923/24 гг. у гімназіі пабачыла свет 9 нумароў вучнёўскага часопіса "Ластаўка", які друкаваўся на шапірографе і распаўсюджваўся па беларускіх школах. У выданні ўдзельнічаў П. Масальскі. У мастацкім афармленні часопіса браў удзел іншы выхаванец гімназіі, будучы мастак і скульптар Лявон Тамашыцкі. Выданне складалася з вучнёўскіх вершаў і прозы. Акрамя таго, у 1924 г. лудзенскія гімназісты падрыхтавалі і выдалі зборнік уласных твораў "Ластаўка"[821]. У ліпені 1923 г. К. Езавітаў пісаў вучаніцы 2-га класа Валянціне Казлоўскай: "*Пры гэтым перасылаюцца Вам папраўленыя мной Вашыя вершы. Папрацуйце над імі яшчэ, пішыце новыя і ўсё гэта перашліце мне зноў, каб можна было надрукаваць у № 2 'Ластаўкі'. Дадаючы да гэтага некалькі паведамленняў аб перааранізацыі нашае Гімназіі ва ўрадавую, вітаю Вас з гэтым агульным нашым святам і прашу Вас, дадаваемыя абвесткі вывешаны былі ў школе Рэйкаўскай і іншых Вашае воласці, а таксама і аб тым, каб усе грамадзяне воласці таксама ведалі аб гэтай справе*"[822]. Кіраўніцтва гімназіі цікавілася маладымі літаратурнымі талентамі, якія трапляліся сярод вучняў пачатковых школ. 25 красавіка 1923 г. кіраўнік Зілупскай беларускай школы прасіў БША звярнуць увагу на вучня V класа Шаўцова, які праяўляў паэтычныя здольнасці. У адказ кіраўніцтва Беларускага школьнага аддзела інфармавала, што творы вучня былі перададзены К. Езавітаву з мэтай друку на старонках вучнёўскага выдання і раіла парупіцца, каб вучань пасля скончэння школы паступіў у Лудзенскую беларускую гімназію[823].

---

[820] *З Латвіі*, "Крывіч" 1923, № 2, с. 62; АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1506.

[821] К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, Рыга 1927 [перадрук: Нью-Ёрк – Менск 2013], с. 103; У. Ляхоўскі, *Ад гоманаўцаў да гайсакоў. Чыннасць беларускіх маладзёвых арганізацый у 2-й палове XIX ст. – 1-й палове XX ст. (да 1939 г.)*, Смаленск 2015, с. 362; П. Сокал, В. Казлоўская, *Выбраныя творы*, рэд. М. Казлоўскі, С. Панізнік, Менск 2016, с. 94.

[822] LVVA, 4932 f., 1 ap., 624 l., 70 lp.

[823] LVVA, 2125 f., 5 ap., 232 l., 46 lp.

У гімназіі была створаная скаўцкая арганізацыя. Дзеля гэтага ў Лудзу быў дэлегаваны ў якасці інструктара Уладзімір Відаўскі[824]. На пачатку 1923 г. быў афіцыйна зарэгістраваны скаўцкі аддзел у лудзенскай гімназіі. Спачатку ён існаваў як філіял 45-га аддзела, які дзейнічаў у Даўгаўпілскай беларускай гімназіі. 14 траўня 1923 г. скаўты вытрымалі іспыт на 3-ю катэгорыю. Тады ж у прысутнасці педрады гімназіі адбылася ўрачыстая прысяга лудзенскіх беларускіх скаўтаў. Яе прынялі наступныя вучні: Янка Доўгі, Якуб Воркуль, Пятро Масальскі, Міхась Калінін, А. Рутко, Язэп Мяжэцкі, Антон Лейтан, А. Паўлоўскі, Барыс Іваноў, Я. Кудраўцоў, Антон Лапацёнак і Мікола Трубяцкі. Стварэнне скаўцкай арганізацыі ў мурах гімназіі вітала кіраўніцтва Беларускага школьнага аддзела. З нагоды гэтай падзеі вось што напісаў яго кіраўнік ў лісце кіраўніку гімназіі: "*Беларускае ўпраўленне жадае, каб маладыя скаўты-беларусы ўсім сваім чуткім сэрцам ухвацілі добрыя запаветы скаўтызму і праводзілі іх у цякучае кругом жыццё, выяўляючы замест варожасці і злосці– ласку і дабро, замест сухога і чэрствага эгаізму – цёплую прыхільнасць і помач галечы; жадае, каб яны неслі на сваіх штандарах праўду, гонар, бескарысную працу, як залог будучага, разумнага, гуманнага і шчаслівага жыцця. Беларускае Упраўленне жадае, каб сябры Люцынскага беларускага скаўцкага атрада былі цвёрдымі грамадзянамі маладой Латвійскай Рэспублікі і каб яны ўзгадавалі ў сабе з маладых гадоў любоў к усяму свайму роднаму, блізкаму, нацыянальнаму; каб яны любілі сваю родную вёску, свайго брата-селяніна, мову, сваю жалобную беларускую песню. Люцынскаму беларускаму скаўцкаму атраду Ура!*"[825]. Са свайго боку кіраўніцтва БША прызначыла асобную суму грошай на закуп для лудзенскіх скаўтаў неабходных рэчаў (панчох, кіёў, нажоў, гальштукаў, кашуль)[826].

15 траўня 1923 г. атрад лудзенскіх скаўтаў стаў самастойным і атрымаў нумар 63. Кіраваў скаўтамі К. Езавітаў, які прызначыў вучня М. Калініна старэйшым важаком. Скаўцкая арганізацыя налічвала 22 сябры. Апрача беларусаў, у яе склад уваходзіў адзін латыш, чатыры рускія і чатыры палякі[827]. Пры аддзеле існавала група ваўчанят, якая складалася з вучняў малодшых класаў[828]. У гімназіі быў таксама створаныя 32-гі дзявочы скаўцкі аддзел (аддзел гайдаў), які, аднак, у красавіку 1924 г. страціў свой нумар, але працягваў існаваць. Скаўцкі рух пачаў пашырацца на правінцыю[829]. У 1923 г.

[824] LVVA, 2125 f., 5 apr., 428 l., 23 lp.

[825] LVVA, 2125 f., 5 apr., 428 l., 8 lp.

[826] LVVA, 2125 f., 5 apr., 428 l., 24 lp.

[827] LVVA, 2125 f., 5 apr., 428 l., 21 lp.

[828] LVVA, 2125 f., 5 apr., 428 l., 77 lp.

[829] У. Ляхоўскі, *Ад гоманаўцаў да гайсакоў. Чыннасць беларускіх маладзёвых арганізацый у 2-й палове XIX ст. – 1-й палове XX ст. (да 1939 г.)*, Смаленск 2015, с. 362; LVVA, 2125 f., 5 apr., 428 l., 82–83 lpp.

у беларускіх пачатковых школах у Зілупе і Пасіене былі створаныя філіялы 63-га аддзела скаўтаў[830].

5 красавіка 1924 г. К. Езавітаў звярнуўся да старшыні ўселатвійскіх скаўтаў, інфармуючы яго пра дзейнасць атрада. Адначасова ён выказваў жаданне атрымаць уласны сцяг і намёты на арганізацыю летніка. Беларускі дзеяч інфармаваў, што ў атрадзе ёсць скаўты, гатовыя вытрымаць іспыт на 2-ю катэгорыю. На думку аўтара, іспыт належала правесці ў Лудзы, паколькі паездка ў Рыгу была вельмі дарагой для моладзі. Акрамя таго, К. Езавітаў прасіў зацвердзіць для 63-га атрада ўласны знак, каб насіць на штандары і на рукаве – блакітны васілёк на бела-чырвона-белым шчыце[831].

Адным з самых актыўных скаўтаў гімназіі з'яўляўся П. Масальскі, які спалучаў дзейнасць на карысць атрада з іншымі абавязкамі. Сведчыць пра гэта яго ліст на імя К. Езавітава (19 траўня 1924 г.), у якім чытаем: "*Праца ў Вучнёўскім Гуртку па выданні часткі 'Ластаўкі' і, акрамя гэтага, праца ў Скаўцкім атрадзе адымалі ў мяне ў працягу апошніх месяцаў не толькі ўсе дні, але нават і ночы, бо праца: карэктарская, рэдактарская, хранікёрская, праца перапісчыка, друкара і брашурыста, узяўшыя ўмясцёх, адрывалі мяне ад усялякае ўласнае прац. Кожны дзень прыходзілася працаваць у Гімназійнай Канцылярыі, друкуючы і распрэдзяляючы матэрыялы, а ўвечары да 2–3 гадзін рання, седзячы за перапісываннем і сшываннем (...) Акрамя гэтай вялікай і неаплачываючай сябе працы мне прыходзілася працаваць і па Скаўцкаму Атраду. Мной было зроблена чатыры паездкі па справах Атраду:дзве ў Рыгу і дзве ў Розенэке і Пасінь. Я за сваю шчырую працу застаўся ў вельмі крытычным становішчы. Адсутнасць абутку і адзежы заставілі мяне сядзець у хаце, не маючы магчымасці зрабіць і некалькі крокаў. Акрамя гэтага, дзякуючы безаплатнай працы і паездкам, у мяне накапіўся значны лік даўгоў, якіх я, у тым ставішчы, у якім я знаходжуся, выплаціць не магу*"[832].

У красавіку 1924 г. 63-і атрад быў расфарміраваны ў сувязі з тым, што яго кіраўніцтва спазнілася падаць звесткі пра яго кіраўніцтву Латвійскага скаўцкага цэнтральнага таварыства (ЛСЦТ)[833]. 20 красавіка 1924 г. К. Езавітаў прасіў у ЛСЦТ дазволу аднавіць дзейнасць беларускіх лудзенскіх скаўтаў. Ён тлумачыў спазненне тым, што атрад малады і не здолеў належным чынам наладзіць працу канцылярыі. Аднак кіраўніцтва агульналатвійскага

---

[830] LVVA, 2125 f., 5 ap., 232 l., 88 lp.

[831] LVVA, 2125 f., 5 ap., 428 l., 77 lp.

[832] LVVA, 2125 f., 5 ap., 428 l., 110 lp.

[833] Э. Екабсонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [в:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 61.

скаўтынгу не прыслухалася да гэтага меркавання[834]. У выніку скаўцкі рух у мурах гімназіі дзейнічаў трохі больш за год, пасля чаго спыніў існаванне.

Акрамя скаўцкай арганізацыі, кіраўнік гімназіі планаваў стварыць сярод навучэнцаў сакольскі рух. З гэтай мэтай увесну 1923 г. ён звярнуўся да кіраўніцтва беларускай арганізацыі "Сокал" у Празе з просьбай даслаць літаратуру і неабходныя матэрыялы (статуты, здымкі, часопісы і г.д.) пра сакольскі рух[835]. Адказ прыйшоў 10 сакавіка 1924 г., калі беларускія сокалы ЧСР выслалі К. Езавітаву літаратуру на розных мовах. Пражане абяцалі дырэктару гімназіі дапамогу ў арганізацыі сакольства[836]. З ініцыятывай стварэння мясцовай суполкі сокалаў выйшаў таксама вучань гімназіі П. Масальскі, які даведаўся пра існаванне беларускага сакольства ў ЧСР з часопіса "Беларускі студэнт". 7 кастрычніка 1923 г. юнак прасіў кіраўнікоў беларускага сакольскага гуртка ў Празе даслаць інструкцыі і літаратуру. У адказ у сакавіку 1924 г. беларускія саколы выслалі П. Масальскаму 8 кніг па сакольскай тэматыцы[837]. Нягледзячы на гэтыя захады, адсутнічаюць звесткі пра існаванне ў Лудзы беларускай сакольскай арганізацыі. Гэта азначае, што справа яе стварэння не выйшла па-за межы планаў.

Існаванне гімназіі паўплывала на фарміраванне беларускай самасвядомасці многіх юнакоў і дзяўчат, якія вучыліся ў яе мурах. Пра тое, што ўстанова пакінула незабыўны след у памяці і сэрцах вучняў, сведчаць успаміны некаторых з іх. Вучаніца старэйшага класа Кацярына Зэйгліш у сваім сачыненні *Як я збіраюся будаваць сваю будучыню* пісала: "*У сучасны момант я вучуся ў Люцынскай Беларускай гімназіі. Першы год майго вучэння ў беларускай гімназіі я яшчэ не разумела ўсіх мэт адраджэння беларускага народа, але зараз ужо пачала разумець гэтыя мэты. Я дужа хацела бы навучыцца гутарыць па-беларуску, назло маім ворагам, не спадабаецца, што я вучуся ў беларускай гімназіі і вучу беларускі язык*"[838]. Тым часам, адзін з яе выхаванцаў Сцяпан

---

[834] LVVA, 2125 f., 5 ap., 428 l., 86 lp.

[835] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 176, л. 1, 14.

[836] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 176, л. 58.

[837] У лісце П. Масальскі пісаў: "*Нядаўна лучыў да мяне № 2–3 'Беларускага студэнта'. Паміж багатага зместу я заўважыў артыкул "Сокальства", які мяне дужа зацікавіў. Аўтар яго, гр. Я. Ермачэнка, падымае пытанне аб стварэнні Сакольскіх гурткоў на Беларусі. Думка гэтая з'яўляецца дужа самавітай і патрэбнай, тым больш беларускай моладзі патрэбна праца, каб дужы і магутны дух яе не марнеў пад цяжарам безыдэйнага існавання. Шчыра кахаючы сваю Бацькаўшчыну й жадаючы ёй вялікае й светлае будучыні, я горача вітаю ідэю і заўсёды гатоў працаваць у кірунку вызвалення свайго Народа. Жадаючы бліжэй азнаёміцца з сакольствам, каб, здабыўшы дазвол Латышскага Ураду на арганізацыю, утварыць тутака Беларускі Сакольскі Гурток, я прашу Вас не адказаць мне ў якнайхутчэйшай прысылцы інфармацый, інструкцый і наогул літаратуры аб сакольстве*". БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 176, л. 15–16, 60.

[838] LVVA, 4932 f., 1 ap., 628 l., 115 lp.

Шаўцоў пісаў: "*Ад той шчаслівай і вясёлай пары асталіся і астануцца толькі адны ўспаміны. Гэтыя ўспаміны зараз, калі я канчаю гімназію, неяк радасна шчымяць маё сэрца, неяк дзіўна чаруюць маю душу. Вобразы за вобразамі становяцца перад маімі вачыма. І што так блізка і дорага цяпер для мяне, тое стаіць перад мной, як жывое, гэта той момант майго вучнёўскага жыцця, калі я пазнаў сваю родную мову. Гэта было ў шостай класе пачатковай школы. Родная мова мілая і дарагая майму сэрцу. Няўжо ж ты маеш такую моцную сілу, такую прыгажосць і паэзію, што змагла зачараваць мяне ў той момант, калі я даведаўся аб цябе. Так, я зараз пэўны ў гэтым. Якаясь невядомая моц, або той магніт, ты прыцягнула да сябе сына сваёй бацькаўшчыны, ты прымусіла мяне ад шчырага сэрца аддацца табе. Да таго часу я не ведаў, хто я ёсць: мяне лічылі маскалём, аб братох па крыві я не ведаў, і толькі тады, калі я пачуў цябе на сцэне (да нас у Зілупэ ў тым годзе прыехала Люцынская беларуская гімназія з пастаноўкай 'Паўлінка'), толькі тады ў мяне заклекатала кроў маіх дзядоў і прадзедаў – беларусаў. Я пачаў чытаць беларускія кніжкі, я пачаў вучыць, па добрай волі, вершы, якія мне падабаліся. У наступным годзе я паступіў у Люцынскую гімназію. Якое вялікае ўражанне зрабіла на мяне гімназія, школа, дзе чутна родная мова, я не магу і апісаць. Тутака я добра зразумеў аб сваёй бацькаўшчыне, аб яе нядолі, аб яе змаганні за лепшае будучае. Тутака я навучыўся і даў слова быць верным і непадкупным сынам прыгнечанага народа. Я так палюбіў сямейку гімназіі, што з вясёлым і радасным пачуццём думаў не разлучацца з ёй чатыры гады, але насунулася хмара ўдараў і пярун над нашай галавой: арышты, следства, вобыскі і ў рэшце рэшт – гімназію зачынілі*"[839].

Нягледзячы на шматабяцальны пачатак дзейнасці гімназіі, яе працай не былі задаволеныя асветныя ўлады. 19 студзеня 1924 г. Лудзенскую беларускую гімназію наведаў школьны старэйшы інспектар Міністэрства асветы Петэрыс Залітыс (*Pēteris Zālītis*). Чыноўнік звярнуў увагу на шэраг заганаў у працы ўстановы. У прыватнасці, ён адзначыў, што некаторыя настаўнікі спазняюцца на працу, у тым ліку дырэктар. Апошні патлумачыў сваё спазненне тым, што ў дзень інспекцыі ў другой палове дня вучні былі вызвалены ад заняткаў з прычыны праваслаўнага свята Вадохрышча. Інспектар, аднак, лічыў, што ў школе зашмат "святочных дзён", што ўскладняе навучальны працэс. Чыноўнік сцвярджаў, што настаўнікі не надаюць належнай увагі навучанню дзяржаўнай мове, і ў выніку вучні ведаюць яе нездавальняюча. Ён выказаў незадаволенасць тым, што, нягледзячы на забарону міністэрства, у школе працавалі два настаўнікі-іншаземцы – С. Казека і Р. Плыгаўка. Рада міністраў двойчы – 25 кастрычніка і 11 снежня 1923 г. – вырашала не дапускаць

[839] С. Шаўцоў, *Вялікія хвіліны (з успамінаў вучнёўскага жыцьця)*, "Школьная праца" 1927, № 8–9, с. 6.

гэтых педагогаў да працы ў латвійскіх школах. На думку інспектара, гэтыя людзі не мелі адпаведнай кваліфікацыі, каб працаваць у дзяржаўнай сярэдняй школе. Акрамя таго, П. Залітыс знайшоў прыкметы грашовых злоўжыванняў у справаводстве школы. Ён зрабіў выснову, што ў перыяд існавання ўстановы як прыватнай прагімназіі таварыства "Бацькаўшчына" не падтрымала яе ніводным рублём, а поўнае ўтрыманне адбывалася за кошт дзяржаўнай дапамогі. За дзяржаўныя грошы таварыства "Бацькаўшчына" зняло будынак на патрэбы школы, але ў фінансавай кнізе гэты выдатак быў пазначаны як грошы, якія паходзілі з прыватных сродкаў. Наступная заўвага інспектара тычылася празмернай колькасці вучняў, вызваленых ад аплаты за навучанне. Больш за тое, трое вучняў, вызваленых ад аплаты, мелі надзвычай слабыя вынікі і сядзелі некалькі гадоў у адным класе. На думку чыноўніка, слабым месцам гімназіі было тое, што навучанне ў II і III класах цалкам адбывалася па-руску, а ў I класе – часткова на рускай мове, а часткова – на беларускай. Настаўнікі і вучні карысталіся навучальным матэрыялам, які паходзіў са старых расійскіх запасаў[840].

У выніку К. Езавітаў быў вымушаны падрыхтаваць тлумачальную запіску. У дакуменце, датаваным 18 лютага 1924 г., ён тлумачыў, што Р. Плыгаўка і С. Казека працуюць у гімназіі, бо няма адпаведных кандыдатаў з латвійскім грамадзянствам, якімі б можна было іх замяніць. Дырэктар падкрэсліваў, што сярод наяўных педагогаў не хапае асоб з дастатковым веданнем беларускай мовы. У сувязі з тым, што гэтыя настаўнікі не атрымалі дазволу Рады міністраў на працу, яны працавалі бясплатна. Навучанне на рускай К. Езавітаў тлумачыў адсутнасцю беларускамоўных настаўнікаў з латвійскім грамадзянствам. На заўвагу інспектара наконт празмернай колькасці выходных у сувязі з рэлігійнымі святамі, К. Езавітаў адказваў, што ў гімназіі практыкуецца наступны прынцып: у святочныя дні на першых двух уроках прысутнічаюць усе вучні, незалежна ад канфесійнай прыналежнасці, потым (на 3-м і 4-м) толькі тыя, хто належыць да веравызнанняў, у якіх няма свята ў той дзень. Астатнія ішлі на набажэнства ў царкву або касцёл, каб вярнуцца ў гімназію на 5-ы ўрок. У дзень інспекцыі – 19 студзеня – было інакш, бо вучні-праваслаўныя ўзялі ўдзел не толькі ў набажэнстве, але і ў хросным ходзе, таму не паспелі вярнуцца на 5-ы ўрок. Таму кіраўніцтва гімназіі адпусціла з 5-га ўрока і ўсіх астатніх вучняў. Высокі працэнт вучняў, вызваленых ад аплаты, кіраўнік гімназіі тлумачыў беднасцю бацькоў[841]. У далейшым адмоўнае меркаванне асветных улад пра гімназію не змянілася на лепшае. Гэта ў рэшце рэшт спрычынілася да яе закрыцця ў 1925 г., пра што будзе гаворка пазней.

[840] LVVA, 1632 f., 2 ap., 493 l., 145–146 lpp.; LVVA, 4932 f., 1 ap., 617 l., 1–4 lpp.

[841] LVVA, 4932 f., 1 ap., 617 l., 5–7 lpp.

Сярэдняя сельскагаспадарчая школа ў Даўгаўпілсе/Краславе. На пачатку 1922 г. таварыства "Бацькаўшчына" пачало старацца ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі пра адкрыццё беларускай сельскагаспадарчай школы[842]. Захады беларускага актыву далі плён, і латвійскія ўлады дазволілі беларусам стварыць у Даўгаўпілсе сярэднюю прыватную сельскагаспадарчую школу. 31 кастрычніка 1922 г. кіраўнік Беларускага школьнага аддзела звярнуўся да дырэктараў беларускіх пачатковых школ Даўгаўпілшчыны з прапановай пашырыць сярод мясцовага сялянства інфармацыю пра існаванне школы. Таксама ён прасіў парупіцца, каб прынамсі адзін вучань з кожнага школьнага раёна паступіў у гэтую ўстанову[843]. Дырэктары мелі склікаць бацькоўскія сходы і на іх тлумачыць "*жыхарству ўсю паважнасьць адчыняемае школы для падняцця вяскова-гаспадарчае культуры сярод беларускага сялянства і зрабіць усе крокі, каб з кожнага школьнага раёна прынамся па адным вучні паступіла ў названую школу*"[844]. Арганізатарам Беларускай прыватнай 2-гадовай сельскагаспадарчай школы быў Аляксей Ластаўкін. Гэта была першая навучальная ўстанова такога кшталту сярод нацыянальных меншасцей. У школу прымаліся кандыдаты ў веку ад 14 да 40 гадоў. Запіс адбываўся ў сядзібе таварыства "Бацькаўшчына". Паводле дамоўленасці паміж Міністэрствам асветы і таварыствам "Бацькаўшчына", першае абавязалася ўтрымліваць двух аграномаў (Аляксея Ластаўкіна і Фрыдрыха Абэле) і забяспечыць школьны інвентар, а другое – утрымліваць будынак. Заняткі пачаліся 1 лістапада 1922 г. У першы год школу наведвала 25 вучняў. Пра беларускі характар школы сведчыла не толькі іх нацыянальнасць, але і заняткі беларусазнаўства. Родную мову ў школе выкладала П. Мядзёлка-Грыб, працу якой аплачвала таварыства "Бацькаўшчына". Дзеля навучальных патрэб кіраўніцтва школы замовіла ў інспектара беларускіх школ шэраг беларускіх кніг, у тым ліку *Зорка* і *Родны край*[845].

Таварыства "Бацькаўшчына" не было ў стане самастойна ўтрымліваць школу, таму звярнулася да беларускай грамадскасці па ахвяраванні. Пэўную падтрымку школе аказала Даўгаўпілская беларуская гімназія. Аднак з прычыны нястачы фінансаў 14 снежня 1922 г. педрада гімназіі была вымушаная адмовіцца ад закупкі для сельскагаспадарчай школы музычных інструментаў[846]. 22 красавіка 1923 г. Рада Беларускага школьнага аддзела пагадзілася дафінансаваць дзейнасць школы пры ўмове, што соймавая камісія адукацыі прызначыць на гэта дадатковыя сродкі[847]. На пасяджэнні 17 верасня

[842] LVVA, 2125 f., 5 apr., 64 l., 1–3 lpp.
[843] LVVA, f. 2125, apr. 5, l. 252, 3 lp.
[844] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 47, л. 18.
[845] LVVA, f. 2125, apr. 5, l. 252, 7 lp.
[846] LVVA, 2067 f., 1 ap., 367 l., 22 lp.
[847] LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 81 lp.

1923 г. Рада БША пагадзілася выдаткаваць пэўную суму на патрэбы школы ў якасці стыпендый для незаможных вучняў. Разам з тым, не было грошай на ўтрыманне школьнай бурсы[848]. У 1924 г. установа была перанесеная з Даўгаўпілса ў Краславу, дзе ўтрымліваць яе было танней[849]. Гэта, аднак, не дапамагло захаванню беларускага характару школы. У красавіку 1924 г. запазычанасць таварыства "Бацькаўшчына" перад Аддзелам сельскагаспадарчых школ Міністэрства земляробства ўзрасло настолькі, што кіраўнік апошняга пагражаў беларусам скіраваць справу ў суд. Не даючы рады ўтрымліваць установу, таварыства "Бацькаўшчына" ў 1923/24 гг. перадало яе Латвійскаму сельскагаспадарчаму таварыству[850].

Такім чынам, школа праіснавала пад патранатам таварыства "Бацькаўшчына" толькі год. Апошняе спрабавала адчыніць другую сельскагаспадарчую школу – пры Залескай беларускай пачатковай школе. Аднак з прычыны адсутнасці сродкаў і ад гэтай задумы давялося адмовіцца[851].

Падсумоўваючы дзейнасць беларускіх сярэдніх школ у Латвіі ў разгляданы час, належыць адзначыць, што яно складалася з дзвюх гімназій (у Даўгаўпілсе і ў Лудзы) і (непрацяглы час) сельскагаспадарчай школы (у Даўгаўпілсе/Краславе). Праз Даўгаўпілскую і Лудзенскую гімназіі прайшло некалькі сотняў вучняў, што паказвае табліца.

Табліца 28. Беларускія гімназіі ў 1922–1925 гг.

	1922/23	**1923/24**	**1924/25**
Школы	2	2	2
Настаўнікі	24	21	23
Вучні	154	167	132

Крыніца: LVVA, 2125 f., 5 ap., 15 l., 21 lp.

Найбольш удалым праектам выявілася Даўгаўпілская гімназія, якую можна лічыць флагманам беларускай школьнай справы ў міжваеннай латвійскай дзяржаве. Яскрава дэманструюць гэта статыстычныя звесткі пра колькасць настаўнікаў і вучняў у абедзвюх школах.

Адкрыццё сярэдніх школ было значным дасягненнем беларускіх дзеячаў. Дзякуючы гэтаму, беларускія юнакі і дзяўчаты змаглі атрымліваць сярэднюю

---

[848] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 12 lp.

[849] *Да 5-ігодзьдзя беларускае адраджэнчае працы ў Латвіі*, "Голас беларуса" 1926, № 34 ад 11 жніўня, с. 2.

[850] LVVA, 2125 f., 5 ap., 381 l., 3 lp.

[851] К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, Рыга 1927 [перадрук: Нью-Ёрк – Менск 2013], с. 68–69; К. Езавітаў, *Беларускае Культурна-Асьветнае Т-ва "Бацькаўшчына" ў Латвіі*, Рыга 1932, с. 20–21.

асвету на роднай мове. Аднак у параўнанні з іншымі нацыянальнымі меншасцямі беларусы мелі найменшую колькасць гімназій (рускія – 25, немцы – 10, габрэі – 9, палякі – 3)[852].

Табліца 29. Сярэднія школы ў Латвіі ў 1922/23 гг.

Нацыянальнасць	Колькасць школ	На якую колькасць насельніцтва прыпадала 1 школа
Латышы	60	18 656
Рускія	25	3 659
Габрэі	9	8 818
Немцы	10	5 809
Палякі	3	17 414
Беларусы	2	33 048

Крыніца: LVVA, 2125 f., 5 apr., 106 l., 1 lp.

Нягледзячы на існаванне беларускіх нацыянальных гімназій, не ўсе мясцовыя беларусы, якія хацелі атрымаць сярэднюю асвету, прайшлі праз іх муры. Напрыклад, у 1924/25 гг. у рускіх сярэдніх школах у Латвіі навучалася 7 беларусаў[853].

Характэрнай рысай абедзвюх гімназій была галеча навучэнцаў. Гэта акалічнасць абумовіла залежнасць школ ад дзяржаўнай падтрымкі. Напрыклад, Лудзенскай гімназіі з дзяржаўнага бюджэту было прызначана 5 тыс. латаў і дадаткова 80 латаў на стыпендыі навучэнцам, што значна перавышала дапамогу для латвійскіх школ. Варта падкрэсліць, што аж 70% вучняў гімназій у Даўгаўпілсе і Лудзы былі вызваленыя ад аплаты. Тым часам, у дачыненні да іншых сярэдніх школ гэта лічба складала 25%[854].

Варта падкрэсліць уклад настаўніцтва гімназій у нацыянальна-культурную працу як сярод моладзі, так і сярод беларускага насельніцтва Латгаліі. Ведаючы нацыянальны патэнцыял тамтэйшых настаўнікаў, 18 верасня 1923 г. Рада БША вырашыла хадайнічаць перад міністрам асветы, каб кіраўнікам гімназій даручылі нагляд за пачатковымі школамі. Дырэктар Даўгаўпілскай гімназіі мусіў апекавацца школамі ў Даўгаўпілскім і Ілукштанскім паветах, дырэктар Лудзенскай – у Лудзенскім і Рэжыцкім. Было таксама вырашана ўзмацніць кантакты паміж пачатковымі школамі і гімназіямі, паколькі

---

[852] К. Езавітаў, *Становішча беларускае школы ў Латвіі*, Вільня 1923, с. 25.

[853] LVVA, 2125 f., 1 ap., 45 l., 25 lp.

[854] К. Казачёнок, *"Белорусский процесс" в Латвии: обвинение, оправдание, наказание*, "Латыши и беларусы: вместе сквозь века. Сборник научных статей", ред. М.Г.Королёв, Минск 2012, с. 40.

частка вучняў з першых працягвала потым навучанне ў другіх[855]. Па распараджэнні Беларускага школьнага аддзела настаўнікі беларускіх сярэдніх школ інспектавалі беларускія пачатковыя школы. У снежні 1923 г. педрада Даўгаўпілскай гімназіі даручыла справу інспекцыі беларускіх школ Даўгаўпілскага і Ілукштанскага паветаў настаўніку У. Пігулеўскаму[856]. 18 снежня 1923 г. кіраўнік БША звярнуўся да дырэкцыі беларускіх гімназій у Даўгаўпілсе і Лудзы з просьбай замацаваць за настаўнікамі абавязак працы з сялянствам у кожнай воласці (лекцыі з чароўным ліхтаром і фільмамі)[857].

У разгляданы час не было беларускіх сярэдніх школ у сталіцы Латвіі. Тамтэйшыя беларускія юнакі і дзяўчаты, якія жадалі атрымаць сярэднюю асвету, наведвалі гімназіі іншых нацыянальнасцей. Беларускі актыў шукаў магчымасці стварыць гімназію ў Рызе. 1 снежня 1921 г. таварыства "Бацькаўшчына" звярнуўся да кіраўніцтва Рыжскай рускай мужчынскай рэальнай гімназіі з просьбай даць звесткі пра беларусаў, якія наведваюць гэтую школу. У звароце адзначалася, што арганізацыя мае сродкі, якія гатовая прызначыць бедным вучням-беларусам, якія навучаюцца ў рускай гімназіі. Цікава, што ў педраду рускай гімназіі звярталіся бацькі вучняў, якія сцвярджалі, што з'яўляццца беларусамі і на гэтай падставе хацелі атрымаць дапамогу[858].

Унутраны канфлікт у асяроддзі беларускага актыву Латвіі

На другі год існавання беларускай культурна-асветнай аўтаноміі ў Латвіі пачалі назірацца рознагалоссі паміж яе арганізатарамі. Нязгода праявілася паміж даўгаўпілскімі і рыжска-лудзенскімі дзеячамі. Да першых належалі прадстаўнікі настаўніцкага актыву Даўгаўпілскай беларускай гімназіі: дырэктар І. Краскоўскі і настаўнікі У. Пігулеўскі, А. Якубецкі, П. Мядзёлка-Грыб, У. Корці. Галоўнымі прадстаўнікамі другога былі кіраўнік Беларускага школьнага аддзела С. Сахараў і дырэктар Лудзенскай беларускай гімназіі К. Езавітаў. Абодва лагеры захоўвалі ідэалагічны і нацыянальны маналіт, але адрозніваліся падыходамі да грамадскай і культурна-асветнай працы сярод беларускага насельніцтва Латвіі. Рознагалоссі тычыліся як беларускіх школ, так і таварыства "Бацькаўшчына", да якога належалі прадстаўнікі абодвух бакоў.

---

[855] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 16 lp.

[856] LVVA, 2067 f., 1 ap., 367 l., 58 lp.

[857] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 48, л. 38; LVVA, 2125 f., 5 apr., 256 l., 70 lp.

[858] LVVA, 2125 f., 5 ap., 392 l., 2, 3 lpp.

Крыніцай інфармацыі, якая дазваляе зразумець іх аргументы, з'яўляецца эпісталярная спадчына ўдзельнікаў спрэчкі. Так, К. Езавітаў сцвярджаў, што розніца паміж бакамі была ў тым, што яго апаненты не ведалі мясцовых рэалій. Прыехаўшы ў Латвію, яны выказвалі незадаволенасць тэмпамі развіцця беларускай нацыянальнай справы ў гэтай краіне[859]. Асабліва дзеяч не шкадаваў крытыкі на адрас І. Краскоўскага і лічыў, што па яго віне П. Мядзёлцы-Грыб не ўдалося ажыццявіць шэраг істотных праектаў, у тым ліку стварыць у Даўгаўпілсе гурток беларускай моладзі, бо дырэктар гімназіі "*баяўся кепскіх уплываў мястовае моладзі на беларускіх гімназістаў*"[860]. У студзені 1923 г.

---

[859] Кастусь Езавітаў наступным чынам тлумачыў сутнасць непаразуменняў з апанентамі: "*Група пачынальнікаў беларускае меншасцёвае працы ў Латвіі з грамадзянамі К. Езавітавым і Сахаравым на чале ясна бачыла, што спыніць паход супроць беларусаў магчыма будзе толькі знізу, толькі тады, калі хваля беларускае свядомасці дакоціцца да беларускае вёскі, калі ў шэрагі змагальнікаў за беларускую школу стануць не толькі свядомыя беларускія інтэлігенты, свабодна ўладаючыя беларускаю моваю, але і беларускія сяляне па вёсках, і беларускія рабочыя па гарадах і тыя беларускія інтэлігенты, у якіх гавора шчырая беларуская душа, хаця ж яны і мала яшчэ ўладаюць літаратурнай беларускай мовай, бо скончылі школу расейскую. Па думцы гэтых грамадзян, трэба было прыцягваць да беларускае працы кажнага этнаграфічнага беларуса, даючы яму час на паступовае нацыянальна-сацыяльнае ўсведамленне і вывучэнне літаратурнае мовы і гістарычнага мінулага беларусаў. Такім паступовым усведамленнем можна было згуртаваць каля беларускіх арганізацый усю беларускую меншасць, і ўжо знізу, праз аддзелы таварыства 'Бацькаўшчына' і праз школьныя рады павятовых беларускіх школ, дамагацца замацавання беларускіх школ пад кіраўніцтвам Беларускага аддзела. Такім чынам, гэтая група дзеячаў стаяла за далейшае пашырэнне працы, прыцягванне новых сіл і паступовае ўсвядомліванне іх. Другая група дзеячаў, арганічна з Латвіяй не звязаная, з латвійскімі ўмовамі мала знаёмая і прыехаўшая сюды пасля таго, як першыя і самыя важныя дасягненні былі беларусамі здабыты (як 50 беларускіх асноўных школ, Беларускі аддзел, беларускія настаўніцкія курсы і бюджэт для 2-х беларускіх гімназій), выяўляла вялікую нецярплівасць, была незадаволена ступенню нацыянальнае свядомасці маладога беларускага грамадства і настаўніцтва, не жадала лічыцца з ім і дамагалася тэрміновых змен. Гэтая група на чале якой станулі гр. гр. І. Краскоўскі і Ул. Пігулеўскі, была супроць далейшага пашырэння працы, супроць цярплівае паступовасці і прыцягвання новых сіл, яна дамагалася пільнае 'чысткі' беларускага грамадства, прынцыпова адкідала ўсіх тых, хто не ўладае мовай, і пакладала вялікія надзеі на тое, што паход супроць беларускіх школ можна будзе спыніць згары шляхам захаду перад Міністэрствам і разнымі латвійскімі палітычнымі групамі*". К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, Рыга 1927 [перадрук: Нью-Ёрк – Менск 2013], с. 96–97.

[860] У сваёй кнізе К. Езавітаў пісаў: "*Прыехаўшы з віленскае беларускае глебы, дзе беларуская нацыянальная свядомасць стаіць дужа высока, а беларускае грамадства мае больш чым чвэрцьвяковую практыку адраджэнчае барацьбы, ён дужа нізка ацэньваў поспехі беларускае працы ў Латвіі, разглядаў беларускае грамадства ў Латгальшчыне неяк згары, схільны быў ганьбіць яго за адсталасць ад Вільні, недацэньваў яго шчырае працы і ўдзельнае вагі ў мясцовым жыцці, а таму ўжо ўвосені 1922 г. ён паспеў перасварыцца немаль з усімі пачынальнікамі беларускага адраджэнчага руху ў Латвіі і заняў нейкае неапраўдальна варожае становішча да ўсяго беларускага грамадства, ізаляваўшыся ў мурах гімназіі, як на нейкай выспе. Гэта пазіцыя*

К. Езавітаў адзначаў: "*Краскоўскі вядзе гэткую ж палітыку, што і Луцкевіч: 'Сонца павінна свяціць толькі там, дзе яны, і толькі ад іх павінна ісці святло; рэшта – павінна быць у цяні, а калі яна і ў цяні свеціць, дык закідаць яе брудам'. Ён пачаў тутака з падкопаў пад Сахарава, бо не меў веры ў тое, што Гімназія адчыніцца, і хацеў быць у Рызе. Я змагаўся. Ён зліўся. Дайшло да асабістых з яго боку мне абраз. Але я вяду працу ў старым маштабе: на Латвію і Дзвінск*"[861]. Ён лічыў, што даўгаўпілскі асяродак не здольны адрозніць інтарэсаў гімназіі ад інтарэсаў таварыства і грамадскіх[862].

Свае аргументы К. Езавітаў не баяўся выказваць апанентам вінавацячы іх у некарэктных паводзінах у адносінах да яго і кіраўніка Беларускага школьнага аддзела. У прыватнасці, ён закідаў кіраўніку Даўгаўпілскай беларускай гімназіі хваравітыя амбіцыі, якія былі прычынай асабістай непрыязі апошняга да К. Езавітава. А гэта перашкаджала спраўнаму функцыянаванню беларускіх школ. У адным з лістоў да І. Краскоўскага ён пералічваў выпадкі неадпаведнага стаўлення да сябе, а таксама нядбайства ў выкананні абавязкаў. Падкрэсліваў, што ён як шматгадовы дзеяч беларускага руху не заслужыў на заганнае стаўленне[863].

была дужа шкоднай, бо цэлы шэраг уплывовых дзвінскіх беларускіх сіл быў адкінуты ад новае пляцоўкі беларускага руху ў Дзвінску, ад Дзвінскае беларускае гімназіі, шмат хто пачуў сябе абражаным у лепшых сваіх пачуццях, дзе-хто быў расчараваны і адышоў ад працы. З Т-ва 'Бацькаўшчына' змушаны былі выйсці шчырыя і карысныя для справы грамадзяне, уся віна якіх была ў тым, што яны ў сваім часе прайшлі расейскую русіфікатарскую школу і зараз не маглі так шпарка загутарыць на сходах па-беларуску, як гэта хацелася новаму нецярпліваму старшыні Т-ва". К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, Рыга 1927 [перадрук: Нью-Ёрк – Менск 2013], с. 98–99.

[861] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1376.

[862] К. Езавітаў, *Беларускае Культурна-Асьветнае Т-ва "Бацькаўшчына" ў Латвіі*, Рыга 1932, с. 24, 25.

[863] У яго лісце (1 студзеня 1923 г.) І. Краскоўскаму чытаем: "*Блізка году таму назад, задыхаючыся тутака ў Латвіі пад непамерным цяжарам нацыянальна-культурнай працы, пры поўнай адсутнасці нацыянальна-ўсвядомленых элементаў, якім можна б было даручыць самастойнае спаўненне тых, ці іншых, нацыянальна-культурных заданняў, – Беларускае культурна-Прасветнае Таварыства 'Бацькаўшчына' з Вашай згоды і жадання, а па маёй рэкамендацыі, просьбе і націску, запрасіла Вас і прадставіла латвійскаму Ураду для працы ў Дзвінскай Беларускай урадовай Гімназіі. Ніхто ў Латвіі Вас не ведаў і аб Вас не чуў. Не быў знаёмы і я асабіста з Вамі. Але адно імя беларуса і беларускага дзеяча адчыніла Вам маё сэрца і сэрца тых, што працавалі са мной разам. Братнім пацалуем спаткаў я Вас і, з усёю шчырасцю, на якую толькі здольна беларуская душа, зрабіў усё, каб адалець усе прэпоны і, для карысці справы, правесці Вас на пасаду Дырэктара Гімназіі. Ні на водную хвіліну не паўставала ў мяне ніводнай цёмнай адносна Вас думкі і з вялікай увагай адносіўся я да кожнае Вашае прапазіцыі і добрае думкі. Але хутка, і якраз з Вашага боку, былі вызваны першыя спрэчкі. Пачалося з таго, што Вы запрапанавалі мне скінуць з пасады Кіраўніка Беларускага Аддзелу, Грамадзяніна С.П. Сахарава, і замяніць яго ў Рызе маёй асобай, а Гр. Сахарава зусім адкінуць ад беларускіх спраў у Латвіі, пакінуўшы яго Дырэктарам Расейскае Гімназіі ў Люцыне. Ведаючы*

Трэба адзначыць, што, нягледзячы на разыходжанні з апанентамі, К. Езавітаў здольны быў ісці на кампрамісы. Увесну 1922 г. у склад Цэнтральнай управы быў кааптаваны І. Краскоўскі. Падчас выбараў новага складу кіраўніцтва таварыства (17 верасня 1922 г.) найбольшую колькасць галасоў атрымаў К. Езавітаў. Аднак ён адмовіўся ад месца ў прэзідыуме ўправы, матывуючы гэта патрэбай захавання адзінства беларускага лагеру – бо ведаў, што супраць яго кандыдатуры выступаюць І. Краскоўскі і У. Пігулеўскі[864]. Ён тлумачыў, што працяглы час зносіў абразы з боку І. Краскоўскага дзеля захавання адзінства беларускага фронту ў Латвіі, але кропляй, якая перапоўніла чашу роспачы, стала нязгода апошняга запрасіць К. Езавітава на новагоднюю вечарыну (студзень 1923 г.) у Даўгаўпілскую беларускую гімназію. Ён пісаў: "*Гэта апошняя абраза, выразна асабістага характару, яскрава малюе мне Вашы да мяне адносіны і настроі. Не ведаючы за сабой ніякіх учынкаў, даючых Вам права на гэткія абразы, і ўсёй душой хварэючы за той разлад, які пачынаеце Вы настойчыва ўносіць у працу, я прымушаны звярнуцца да абароны свайго гонару і беларускае справы да Беларускага Грамадзянства ў Латвіі і заклікаю Вас, Ян Ігнатавіч, на Грамадскі Суд Гонару. Заклікаючы Вас на Грамадскі Суд, адзначаю, што і цяперака яшчэ няма ў мяне да Вас ніякае асабістае злобы, а баліць маё сэрца ад незаслужанай абразы і крывяніцца яно той справай, якую давялося мне пачынаць тутака, у Латвіі*"[865].

Пры гэтым К. Езавітаў выступаў за тое, каб не выносіць "брудаў на вуліцу"[866]. Нягледзячы на гэта, унутраны канфілікт між лідарамі латвійскіх беларусаў хутка стаў вядомы па-за межамі Латвіі. Адной з першых праяў гэтага стаў артыкул *Нарада беларускіх вучыцелеў беларускіх школ у Латвіі* на старонках заходнебеларускай газеты "Наша будучыня" (20 студзеня 1923 г.).

С.П. Сахарава як шчырага беларускага дзеяча, з вялікай адвагай і энергіяй узяўшагася за беларускую працу ў Латвіі, – я рашуча адмовіўся ад гэтага кроку. Не глядзячы на мой рашучы адказ, Вы потым у працягу некалькіх месяцаў зноў і зноў зварачваліся да мяне з гэтай тэмай (...) Я зусім не разумеў нашто нам, беларусам, такая барацьба патрэбна і, наадварот, усякую ўнутраную барацьбу ў сучасны момант лічыў шкоднай і здраднай, ды апрача таго думаў, што рэальная праца над будовай Гімназіі і рамонтам будынка сцішыць Вашыя ваяўнічыя настроі і дасць Вашай энергіі творчы напрамак, а таму і не прыдаваў заяве Вашай дужа важнага значэння. Праца над Гімназіяй запраўды сцішыла спрэчкі аб Кіраўніку Аддзела, але выклікала затое новыя. Вам не падабаліся некаторыя мае ўвагі як Члена Рамонтнай камісіі, і Вы заўсёды дужа востра на мяне нападалі, а іншы раз і даволі груба абрывалі. Я – маўчаў, бо ведаў, што Вы іншы раз бываеце хворы, ды, апрача таго, шмат было ў Вас у той час чыста асабістых непрыемнасцей і ўдараў". АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1376–1378.

[864] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1378.

[865] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1380.

[866] У лісце К. Езавітава (14 студзеня 1923 г.) В. Ластоўскаму чытаем: "*Я проці вынясення бруды на вуліцу, але калі ён будзе публікаваць, дык хай пачынае ён, а я не хачу гэтага рабіць*". АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1385.

Ён быў надрукаваны пад псеўданімам "вучаснік вучыцельскай нарады". Аўтар падзяліўся крытычнымі думкамі наконт працы кіраўніка Беларускага аддзела С. Сахарава і інспектара беларускіх школ К. Езавітава. Ён лічыў, што цяжкасці беларускай школьнай справы, а перадусім адсутнасць у школах беларускай мовы, з'яўляюцца вынікам няздарнай працы К. Езавітава. Падсумоўваючы свае высновы, ананімны аўтар пісаў: "*Стала ясна, што інспектар беларускіх школ у Латвіі не здолен да творчае працы, грунтоўнае працы і таму падуладныя яму школкі найчасцей маюць толькі 'беларускі' шыльд, а за ім робіцца ці расейская ці польская работа, варожым беларускасці вучыцелем. Падобныя 'беларускія школкі' не патрэбны ні беларускай людназці, ні для белар. інтэлігенцыі, ні латвійскаму ўраду, які ўтрымлівае іх на дзяржаўныя кошты. Агульным жаданнем латвійскіх беларусаў ёсць, каб беларуская школьная справа была высвабаджана ад прымазаўшыхся да яе элемэнтаў. А пану Інспектару ці не варта было-б падумаць і перадаць сваю працу больш здольнай і свядомай у школьных справах асобе?*"[867].

Кастусь Езавітаў быў абражаны дэмаршам апанента. Ён называў яго ўчынак ганебным і нікчэмным і сцвярджаў, што аўтар зрабіў так "ці то па дурноце сваёй ці то ў мэтах правакацыйных"[868]. Сваю пазіцыю К. Езавітаў тлумачыў у лісце Пятру Крачэўскаму і Васілю Захарку (16 кастрычніка 1923 г.). Каб зразумець пазіцыю дзеяча, трэба прывесці значны ўрывак з яго ліста: "*Беларускае нацыянальнае адраджэнне ў Латвіі (...) гэта – прыгожы цуд, які стварыўся толькі таму, што я добра ведаў мясцовыя варункі і шмат меў асабістых знаёмых, якія йшлі за мной, ведалі мяне дзясяткі гадоў. Не думайце, што тутака гаворыць 'езавітаўшчына', або гонар, ці нахвальба. Аб'ектыўныя варункі склаліся гэтак. Усё рабіў я, але, каб не казалі, што гэта езавітаўшчына і манапалізацыя, я прыцягваў мясцовыя сілы, усведамляў іх і выстаўляў усюды, куды толькі можна. А так як гэтых людзей ведалі яшчэ дзясяткі мясцовых людзей, дык за імі ўцягнуліся і яны. Такім чынам рух пачаў рабіцца шырокім, абхопліваючы ўсіх, прыцягваючы масы. Праўда, яны прыходзілі несвядомымі, але на тое ж і трэба праца. Трэба ўсведамляць. На тое і праца (...) Ну, так ішла праца да прыезду Краскоўскага і Якубецкага. Яны ж пачалі з таго, што ўсіх маласвядомых і несвядомых абазвалі 'маскалямі' і прагналі ад сябе. Харлап, Васільева, Васільеў, Хмялеўскі, Сапега (усе дзвінчане, якія былі ў праўленні 'Бацькаўшчыны' але не гутарылі па-беларуску, бо не мелі яшчэ часу для практыкі) – усе гэтыя асобы, з якімі я пачынаў рух і якія шчыра мне дапамагалі – былі выкінутыя з праўлення і Т-ва. Нават мяне і тое Краскоўскі не мог цярпець. Пачалася глупая траўля і раскол. Людзі пачалі разбягацца.*

---

[867] Вучасьнік вучыцельскай Нарады, *Нарада вучыцялёў Беларускіх школ ў Латвіі*, "Наша будучыня" 1923, № 3 ад 20 студзеня, с. 2.

[868] LVVA, 2125 f., 5 apr., 38 l., 803 lp.

На курсах вучыцялёў Пігулеўскі і Краскоўскі, а асабліва Якубецкі (летам гэтага года) гэтак груба сябе трымалі, што ўсё вучыцельства абурылася і пачало вапіць у голас. Ледзьве не выйшаў агромны скандал, але мне ўдалося яго замяць. Краскоўскі на Кангрэс вучыцялёў не з'явіўся. На момант яны расцяраліся. Але цяперака пачынаюць вайну ўсярэдзіне сваіх жа. Пачалася траўля мяне і Сахарава. Я з боллю гляджу на гэта хазяйнічанне. Калі наша справа тутака міне, дык Краскоўскі зложыць свае чамаданы і выедзе, які і рабіў раней усюды, дзе ён праваліўся. Ну а я – тутэйшы. Бяжаць мне няма куды. Далей. Яны не адчуваюць шкоднасці за тое, што робяць, а я хварэю штодня. Што да масы беларусаў, дык яны інертныя і да гэтага часу пад уплывамі царквы і касцёлу, а знача расейцаў і палякаў. Трэба планавая і асцярожная праца без вялікага нажыму і дзёргання. А гэтага Краскоўскі не разумее. Можа ёсць і ў яго якія планы і довады, але я аб іх не ведаю і не чую. Наагул, апрача нападкаў, абраз і агітацыі супраць мяне, я нічога пра яго не чуў. Гутаркі твае аб забяспечаных пасадах і аб абывацельстве ты вазьмі назад, бо гэта для мяне абраза. Я не маю ніякага асабістага жыцця. Шмат грашэй кідаю на вучняў і працу. А тутака 'абывацельства'. Сорам табе, Пятрук, за гэта, бо ты ведаеш мяне болей, чым Краскоўскага"[869].

На гэтым справа не скончылася. У снежні 1923 г. на старонках віленскай газеты "Змаганьне" з'явіўся шэраг зацемак У. Пігулеўскага (пад псеўданімам "Гуль") пад назвай *Пісьмы з Латвіі*, у якіх аўтар ахарактарызаваў сітуацыю беларускай справы ў Латвіі як катастрафічную. Ён адмоўна ацэньваў нацыянальны дух беларускага настаўніцтва лічачы, што 55% настаўнікаў "*не толькі не знаёма з беларускай гісторыяй, літаратурай, але і нават не ўмее гаварыць, чытаць і пісаць па-беларуску*"[870]. Аўтар лічыў, што мясцовае беларускае настаўніцтва падзяляецца на беларускае (адданае нацыянальна-беларускаму напрамку) і "руссо-беларускае". На яго думку, пад уплывам апошняга ў беларускіх школах не было чуваць беларускай мовы. Аўтар лічыў, што С. Сахараў і К. Езавітаў прыцягнулі ў беларускія школы "*значны лік вучыцельства не толькі афіцыйна небеларускага па нацыянальнасці, але нават з ідэалогіяй варожай да беларускай нацыянальнай ідэі*"[871]. Ідэйным правадыром "руссо-беларусаў" аўтар лічыў К. Езавітава, якога вінаваціў у прарасійскай арыентацыі. На доказ сваіх слоў У. Пігулеўскі даводзіў, што К. Езавітаў не жадае пазбаўляць працы ў беларускіх школах настаўнікаў, якія не валодаюць беларускай мовай і нават дэманструюць варожае стаўленне да беларускасці. Больш за тое, аўтар прыпісваў апаненту альянс з рускімі дзеячамі падчас парламенцкіх выбараў у 1922 г. Логавам "руссо-беларусаў"

[869] ГАРФ, ф. 5875, оп. 1, д. 11, л. 476–477 зв.

[870] Гуль, *Пісьмы з Латвіі*, "Змаганьне" 1923, № 14 ад 5 снежня 1923 г., с. 2.

[871] Гуль, *Пісьмы з Латвіі*, "Змаганьне" 1923, № 14 ад 5 снежня 1923 г., с. 2.

аўтар лічыў Лудзу, дзе К. Езавітаў кіраваў беларускай гімназіяй. Ён пісаў: "*У Люцынскім павеце была вялікая армія руссо-беларускага вучыцельства, сярод якога нацыянальны беларускі вучыцель быў быццам белай варонай. Армія гэта мела сваіх важакоў, але не мела яшчэ павадыра, вядомага беларускага дзеяча, і гэтую ролю прыняў на сябе гр. Езавітаў, пераехаўшы ў стан сваёй будучай арміі – у г. Люцын*"[872]. Лудзенскаму асяродку аўтар публікацыі супрацьпастаўляў даўгаўпілскі (беларускую школу і гімназію, настаўніцкія курсы) як цэнтр "чыста нацыянальна-беларускі"[873].

Аўтар вінаваціў К. Езавітава ў тым, што ён абараняў "русско-белорусское" настаўніцтва падчас настаўніцкага з'езда 10 жніўня 1923 г. Крытыка У. Пігулеўскага была скіраваная не толькі супраць К. Езавітава, але і супраць кіраўніка БША. Апошняга аўтар вінаваціў у нежаданні браць на працу ў беларускія школы нацыянальна свядомых і падрыхтаваных беларускіх настаўнікаў. На думку аўтара, замест гэтага С. Сахараў імкнецца трымаць "вучыцялёў расейцаў і палякаў" і асоб, якія "ніколі з беларускім рухам нічога супольнага не мелі і ня маюць". Уладзімір Пігулеўскі сцвярджаў, што такая лінія моцна дыскрэдытуе беларускіх дзеячаў у вачах латвійскіх улад. Аўтар пераконваў, што латышы гатовыя падтрымаць "чыстую нацыянальную ідэю", а не рух, які складаецца з людзей, якія сярод латышоў вядомыя як "старыя русіфікатары"[874]. Падсумоўваючы свае высновы, аўтар выказаў меркаванне, што шлях, абраны К. Езавітавым і С. Сахаравым, прывядзе беларускую справу ў Латвіі да катастрофы: "*Я не бяру на сябе ролю прарока, але павінен голасна і адкрыта сказаць, што сучасны шлях кіруючай групы на чале з гр. Сахаравым і Езавітавым вядзе да гібелі Справы, да катастрофы. Банкруцтва гэтай групы па ўсяму фронту – як па ўнутранаму ідэёваму, так і па вонкаваму афіцыяльнаму – ёсць аб'ектыўны факт жыцця, што гаворыць ясна сам за сябе. Палажэнне, праўда, катастрафічнае, але ўсё ж такі аб'ектыўная ацэнка абставінаў паказвае, што выхад знайсці можна. Можна знайсці шлях, па якому можа і дарагой цаной, але ўсё такі магчыма падняць беларускую справу і паставіць яе на цвёрды грунт*"[875].

У наступнай зацемцы У. Пігулеўскі абвінаваціў кіраўніка БША ў некампетэнтнасці і няздольнасці годна прадстаўляць беларускія інтарэсы ў Міністэрстве асветы. У якасці прыкладу ён сцвярджаў, што сярод супрацоўнікаў Беларускага школьнага аддзела знаходзіцца "захоплены старэчым маразмам" справавод Я. Шчорс. Далей У. Пігулеўскі пісаў, што, нягледзячы на тое, што латышы неаднаразова звярталі ўвагу на некампетэнтнасць Я. Шчорса, кіраўнік аддзела

---

872 Гуль, *Пісьмы з Латвіі*, "Змаганьне" 1923, № 13 ад 2 снежня 1923 г., с. 2–3.

873 Тамсама.

874 Гуль, *Пісьмы з Латвіі*, "Змаганьне" 1923, № 14 ад 5 снежня 1923 г., с. 2–3.

875 Гуль, *Пісьмы з Латвіі,* "Змаганьне" 1923, № 14 ад 5 снежня, с. 2.

паслядоўна адмаўляўся адхіліць яго ад працы. Аўтар лічыў гэтыя паводзіны мэтаскіраванай шкодай беларускай справе. На думку аўтара, С. Сахараў не звяртаў увагі на пратэсты педрады Даўгаўпілскай беларускай гімназіі[876].

Рэдакцыя газеты "Змаганьне" прапанавала К. Езавітаву адказаць. Але той лічыў абвінавачанні "Гуля" беспадстаўнымі і нават абсурднымі да такой ступені, што не бачыў патрэбы на іх адказваць. Ён звяртаў увагу на тое, што не можа дзейнічаць на шкоду беларускаму руху ў Латвіі, паколькі ён сам яго стварыў "з нуля". У лісце К. Езавітава чытаем: "*Ніякай ролі кіраўніка 'руска-беларускай' групы беларускага вучыцельства я на сябе не браў, і ні ў якую 'апазіцыю' да беларускага нацыянальнага руху ў Латвіі я не станавіўся ды і станавіцца не мог, бо гэты рух я сам тутака пачынаў і закладаў яго ўласнымі рукамі і ініцыятывай (...) Не Езавітаў 'гуртаваў' апазіцыю беларускаму адраджэнню ў Латвіі і збіраў сілы для зусім непатрэбнага яму і дужа шкоднага для справы 'бою', а якраз наадварот – гр. Пігулеўскі, кіраваўшы курсамі ў Дзвінску, сваёй нетактоўнасцю, сухасцю, пакрыківаннямі, салдацка-чыноўніцкімі адносінамі да вучыцельства зрабіў тое, што ўзбурыў на сябе ўсіх курсантаў і зрабіў іх варожымі да Дзвінскага беларускага цэнтра*"[877]. Акрамя таго К. Езавітаў пісаў: "*Вінен прызнацца беларускаму грамадзянству, што, хоць і моцна былі пакрыўджаны мае імя і гонар, але не збіраўся я даваць ніякага адказу на тыя брудныя закіды і выдумкі, што зрабіў 'Гуль' у сваіх 'Пісьмах з Латвіі' (...) Не збіраўся даваць адказу не таму, што лічу сябе хоць трошкі вінным, а таму, што ва ўсёй гэтай, паднятай 'Гулем', друкаванай лаянцы бачыў і бачу вялікую шкоду для нашага нацыянальнага адраджэння наогул, а для працы ў Латвіі – асабліва. Меў надзею і на тое, што, не спатыкаўшы з майго боку адпору, адумаецца гр. Гуль і не пойдзе на далейшую грызню, якая з'яўляецца для нашае нацыянальнае меншасці ў Латвіі яўнай згубай. Але надзеі не апраўдаліся. Гр. 'Гуль' (...) не толькі не спыніў сваіх закідаў, але пачаў ужо штось іншае, зусім ужо бруднае – 'захады' прад Латвійскім Урадам і 'належную інфармацыю' Соймавых колаў. Вынікі гэтых 'захадаў' могуць хутка сказацца. Якія яны будуць – варажыць не трэба, кожны дзяцюк гэта разумее. Дзеля гэтага адмоўчвацца далей лічу немагчымым*"[878].

Нягледзячы на вастрыню спрэчкі, К. Езавітаў лічыў, што зарукай поспеху беларускага руху ў Латвіі ёсць згода і салідарная праца яго ўдзельнікаў, а не сваркі і закалоты[879]. Яго заклік не знайшоў, аднак, водгуку ў асяроддзі апанентаў, якія паслядоўна імкнуліся да эскалацыі канфлікту. Так, 19 снежня 1923 г. група дзвінчукоў (І. Краскоўскі, У. Пігулеўскі, П. Мядзёлка-Грыб,

---

[876] Гуль, *Пісьмо з Латвіі,* "Змаганьне" 1923, № 18 ад 14 снежня, с. 2.

[877] LVVA, 2125 f., 5 ap., 105 l., 21 lp.

[878] LVVA, 2125 f., 5 ap., 105 l., 18 lp.

[879] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 54, л. 1–7.

В. Корці, А. Якубецкі) накіравала міністру асветы зварот, у якім інфармавала, што не нясе адказнасці за наступствы дзейнасці сваіх апанентаў і абранага імі напрамку працы. Аўтары дакаралі кіраўніцтва БША за тое, што яно, замест настаўнікаў з ліку нацыянальна-свядомага элементу (перадусім меліся на ўвазе выхаванцы беларускіх настаўніцкіх курсаў), брала ў школы асообы з царскім педагагічным досведам, якія варожа ставіліся да беларускасці[880]. У абарону С. Сахарава выступіў К. Езавітаў, які сцвярджаў, што абвінавачанні даўгаўпілскага актыву ў бок кіраўніка БША (нібыта ён "трымаецца за ўладу") з'яўляюцца галаслоўнымі[881].

Унутраны антаганізм яскрава праявіўся падчас працы беларускіх настаўніцкіх курсаў. Жыхары Даўгаўпілса І. Краскоўскі і У. Пігулеўскі трымаліся думкі, што неабходна ачысціць настаўніцкія шэрагі ад "варожага элемента". Яны прапаноўвалі звольніць з працы 20 настаўнікаў, з якіх 11 у пашпартах не былі пазначаны беларусамі. Дзеячы сцвярджалі, што такая "ампутацыя" непазбежная, а зрабіць яе магчыма шляхам арганізацыі летніх курсаў павышэння кваліфікацыі, дзякуючы якім адсеюцца "непатрэбныя" людзі[882]. На думку І. Краскоўскага, 27 выпускнікоў, якія вытрымаюць канцавы іспыт, будуць не зусім падрыхтаванымі ў прафесійным сэнсе, але кампенсуюць гэта нацыянальным запалам. Кіраўніцтва Беларускага школьнага аддзела, замест гэтага, прыняло рашэнне перанесці настаўніцкія курсы з Даўгаўпілса ў Рыгу. Гэты крок быў прадыктаваны жаданнем пазбавіць даўгаўпілсцаў уплыву на курсантаў[883]. Кіраўнік БША лічыў, што кіраўнік курсаў У. Пігулеўскі сваімі неадпаведнымі паводзінамі адштурхоўваў слухачоў ад навучання і іспыту. На яго думку, халоднае стаўленне кіраўніка прывяло да таго, што ўтварыўся мур паміж курсантамі і кіраўніцтвам. У выніку ўдзельнікі настаўніцкай кан-

---

[880] LVVA, 1632 f., 2 apr., 493 l., 133–135 lpp.

[881] LVVA, 2125 f., 5 ap., 105 l., 14 lp.

[882] У лісце У. Пігулеўскага чытаем: "*Тыя 27 чалавек, якіх мы выпусцілі з сярэдняй школы і гадавых вучыцельскіх курсаў, былі, можа быць, і не зусім цэнныя з боку педагагічнага, але затое яны былі строга нацыянальным элементам; і так трэба было зрабіць ампутацыю: звольніць 20 вучыцеляў ворагаў, з якіх 11 нават па пашпартах не хочуць лічыцца беларусамі, і на іх месца прызначыць новыя сілы. Сахараў прапанаваў правесці гэта гэткім чынам: зарганізаваць летнія курсы, на чале якіх стаю я. За лета мы высветлім самы найгоршы элемент і пасведчанне аб сканчэнні курсаў выдадзім свядомай нацыянальнай частцы. Беларускае ўпраўленне кожны год выдае пасведчанні-дазволы працаваць у беларускіх школах, – гэтыя дазволы выдаць толькі тым вучыцелям, у каторых будуць пасведчанні нашых курсаў. Каб было фармальна юрыдычнай падставай для нявыдачы пасведчання аб сканчэнні курсаў, мы прызначылі ўсім іспыты па прадметах беларусаведання*". *Крывіцкія руны. Вып. II: Беларускі культурны мацярык у Латвіі*, укл.: М. Казлоўскі, С. Панізьнік, Менск 2017, с. 147.

[883] К. Казачёнок, *"Белорусский процесс" в Латвии: обвинение, оправдание, наказание*, "Латыши и беларусы: вместе сквозь века. Сборник научных статей", ред. М.Г.Королёв, Минск 2012, с. 37, 39.

ферэнцыі (11–12 жніўня 1923 г.) не абралі нікога з "дзвінскай групы" ў прэзідыум[884]. Дзейнасць У. Пігулеўскага шкоднай лічыў таксама К. Езавітаў, які сцвярджаў, што першы сваёй "нетактычнасцю, сухатой, пакрыкваннем, салдацка-чыноўніцкімі адносінамі да настаўнікаў" выклікаў атмасферу пярэпалаху і няпэўнасці за ўласную кар'еру. Нежаданне большасці курсантаў здаваць іспыт па беларусазнаўстве К. Езавітаў тлумачыў не іх антыбеларускасцю, а страхам перад помстай з боку У. Пігулеўскага[885].

Даўгаўпілская група не збіралася здавацца. 22 снежня 1923 г. у Даўгаўпілсе была склікана "Канферэнцыя беларускага нацыянальнага вучыцельства" (старшыня Канстанцін Дубавік), у якой узялі ўдзел 29 чал., у тым ліку У. Пігулеўскі, М. Дзямідаў, П. Мядзёлка-Грыб, І. Краскоўскі, С. Махноўскі і інш. Пасля дакладаў Э. Вайводзіша, У. Пігулеўскага і М. Дзямідава ўдзельнікі прынялі рашэнне "*з прычыны ненармальнай працы Беларускага Аддзелу, невыразнасці яго нацыянальнага напрамку, шкоднай працы дзелавода Шчорса, беларуская нацыянальная справа знаходзіцца ў катастрафічным становішчы і вымагае хуткіх і рашучых мер; змены ў самым складзе Беларускага Упраўлення*"[886]. Удзельнікі бачылі патрэбу змены С. Сахарава на пасадзе кіраўніка БША. У якасці кандыдата яны прапанавалі У. Пігулеўскага як "*здольнага і энергічнага, які зможа вывесці беларускую культурную працу ў Латвіі на просты чэсны шлях нацыянальнага адарджэння Беларускага народа ў Латвіі*"[887].

Удзельнікі канферэнцыі падрыхтавалі зварот да міністра асветы, пад якім падпісаліся І. Краскоўскі, У. Пігулеўскі, П. Мядзёлка-Грыб, А. Якубецкі і інш. Аўтары звярталі ўвага на "слабы характар" С. Сахарава, праз што ў беларускіх школах па-ранейшаму працавалі настаўнікі, якія варожа ставіліся да беларускасці. Больш за тое, аўтары вінавацілі кіраўніцтва БША ў тым, што яно не жадала прыняць на працу ў школе выпускнікоў Даўгаўпілскіх беларускіх настаўніцкіх курсаў, а замест гэтага адмовілася звольніць удзельнікаў летніх курсаў, якія былі непрыхільнымі да беларускай справы. У звароце адзначалася, што БША павінен рашуча змагацца з настаўніцтвам, якое не лічыць сябе беларускім паводле духу, але працуе ў беларускіх школах. На Беларускі школьны аддзел ускладалася таксама адказнасць за ліквідацыю настаўніцкіх курсаў[888]. У адказ кіраўніцтва БША скіравала міністру асветы ліст, у якім тлумачыла сутнасць канфлікту. Дзеянні "дзвінскай групы" ў дакуменце падаваліся як шкодныя і безадказныя. Кіраўнік Беларускага школьнага аддзела

---

[884] LVVA, 1632 f., 2 apr., 493 l., 130–132 lpp.

[885] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 54, л. 1–7.

[886] НАРБ. ф. 458, воп. 1, спр. 113, л. 3.

[887] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 113, л. 3.

[888] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 107, л. 34–36.

лічыў беспадстаўнымі абвінавачанні ў памылковай кадравай палітыцы. Ён адзначаў, што на пасады ў беларускіх школах прызначаў настаўнікаў-беларусаў, якія, хоць і былі выхаваныя старой царскай школай, але як беларусы паводле паходжання разумелі культуру і нораў беларускага сялянства[889].

У абарону кіраўніка Беларускага школьнага аддзела выступіла сталічнае беларускае настаўніцтва. Настаўнікі Рыжскай беларускай школы падрыхтавалі мемарыял, у якім асудзілі крок даўгаўпілскіх дзеячаў і выказалі поўны давер кіраўніцтву БША. У дакуменце падкрэслівалася, што акрамя І. Краскоўскага, У. Пігулеўскага і П. Мядзёлкі-Грыб, у даўгаўпілскай канферэнцыі ўзяло ўдзел усяго некалькі правінцыйных настаўнікаў, а астатнія подпісы з'явіліся ўжо пасля мерапрыемства. Рыжане прапанавалі як мага хутчэй склікаць агульналатвійскі беларускі настаўніцкі кангрэс, які павінен выказаць падтрымку працы С. Сахарава[890].

Справай зацікавіліся беларускія дзеячы за межамі Латвіі, пра што сведчыць ліставанне паміж імі і ўдзельнікамі канфлікту. Прэм'ер А. Цвікевіч лічыў, што персанальныя канфлікты паміж беларускімі дзеячамі ў Латвіі могуць спрычыніцца да заняпаду беларускага руху ў гэтай краіне. Кастусь Езавітаў сцвярджаў, што прычынай сваркі з'яўляюцца хваравітыя амбіцыі і складаны характар І. Краскоўскага. 1 студзеня 1924 г. К. Езавітаў у лісце пражскім беларусам – В. Захарку і П. Крачэўскаму – фармуляваў абвінавачанні на адрас І. Краскоўскага. Аўтар звяртаў увагу на яго ганарыстасць і фанабэрыстасць (выказванні накшталт: "Вільня толькі на ім трымалася") адзначаючы, што ён "*спачатку радзіў, потым настаяцельна рэкамендаваў, потым трэбаваў, а за тым проста-напраста ўсвоіў сабе звычай заяўляць у тых выпадках, калі з ім не згаджаліся, што пачне рашучую барацьбу, што ён будзе змагацца і г.д.*")[891]. Кастусь Езавітаў падкрэсліваў, што запрасіў І. Краскоўскага ў Латвію як "*здольнага беларуса падчас з'езда беларусаў Заходняга фронту ў 1917 г., але калі б ведаў яго сапраўдную натуру, дык не рабіў бы гэтага*"[892].

---

[889] LVVA, 1632 f., 2 apr., 493 l., 130–132 lpp.

[890] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 111, л. 10, 11.

[891] ГАРФ, ф. 5875, оп. 1, д. 11, л. 431.

[892] Далей у лісце К. Езавітава чытаем: "*У кожным бачыць ворага беларушчыны ('скуль гэты настрой у Яна Ігнатавіча я катэгарычна судзіць не бяруся, мне не хацелася бы нават казаць, што ўсё гэта заложана ў дрэнным неграмадскім характары яго і таму я больш схільны думаць, што 5 гадоў безупыннай працы яго ў украінцаў у абстаноўцы ўзаемных інтрыг і падкопванняў выхавалі яго такім чынам, што ён чуць не ў кожным супрацоўніку бачыць і падазраваець сабе асабістага ворага, справе чорнага здрадніка') (...) цяпер я толькі сумую што няма лякарства на яго хваробу і з гэтым пастаянным падазрэннем да ўсіх ён так і памрэ. Бо Ян Ігнатавіч байкатуе і ўвесь час пагражае, што калі не будзе грамадзянін Сахараў заменен грамадзянінам Пігулеўскім, дык ён пачне барацьбу з аддзелам у беларускай і латышскай прэсе.*

У снежні 1923 г. група даўгаўпілскіх беларускіх дзеячаў накіравала ліст прэм'еру БНР А. Цвікевічу, у якім прадставіла ўласны погляд на становішча беларускага руху ў Латвіі. Аўтары лічылі непраўдзівым бачанне канфлікту праз прызму персанальнай сваркі і сцвярджалі, што ён з'яўляецца выніkам тактычнага разыходжання ў падыходах да беларускай справы[893]. Адзін з удзельнікаў групы, У. Пігулеўскі ў лісце (10 студзеня 1924 г.) В. Ластоўскаму пісаў: "*Не магу я асабіста змагацца з Ез.[авітавым], бо не лічу яго вінаватым. Утыкалі яго, гэтага добрага 'малога', паўліннімі пер'ямі, і ён запраўды паверыў, што 'l'etat c'est moi' – 'Беларусь – гэта я'*"[894]. У іншым лісце былому прэм'еру БНР ён звяртаў увагу на тое, што К. Езавітаў, не ўзгадняючы з нікім, рассылаў настаўнікам "Слоўнік геамэтрычных і трыганамэтрычных тэрмінаў і сказаў". У выніку апошнія былі незадаволеныя высокімі коштамі, якія ім давялося панесці. Аргументы аўтара не знайшлі разумення ў В. Ластоўскага,

---

Гэту барацьбу я лічу шкоднай, бо яна ідзе на карысьць як элементам расейскім так і элементам польскім. Шукаў я згоды, але на жаль згаварыцца з Янам Ігнатавічам цяжка, бо ён хоча толькі дыктаваць (...) У культурна-прасветным напрамку мы дабіліся толькі школак, яшчэ перад намі нацыянальны друк, нацыянальныя таварыствы, нацыянальная пазашкольная праца, яшчэ цаліком не закранута задача шырокага ўсведамленьня сялянскіх мас, сярод якіх мы маем не толькі пагалоўна нацыянальна несвядомых, але і наагул зусім няграматных, да 80%. зразумела, што ніякіх сварак у нас не павінна быць. Працы ўва ўсіх па горла. Патрэбна згода. Патрэбны частыя спатканні і гутаркі. Абмен думак па патыннях канкрэтнай працы. Няма і не павінна быць месца ніякім дыктатурам, бо і яны непатрэбны, бо дзяржаўна-адміністратыўнай працы ў нас няма. Я на сябе ніякіх роляў не браў, не бяру і браць не жадаю. Што да працы,то працаваў, працую і працаваць буду. Ні ў якія Амерыкі я не збіраўся і не збіраюся ехаць. Не ведаю, хто мяне туды пасылае. З беларускім рухам у Латвіі я звязаны ні толькі ініцыятывай яго, але як грамадзянін гэтае дзяржавы. Ведаю і вялікае значэнне нашае працы тутака для ўсяго руху беларускага, як з боку маральнага, гэтак і з боку фактычных дасціжэнняў (…) Правал працы тутака будзе не толькі ўдарам па гонару майму, але і па самых мэтах працы маёй. І разам з гэтым усё ж такі падкрэсліваю, што не хацеў, не хачу і не збіраюся лічыць сябе апосталам працы тутака і дамагацца якойсь асобнай манаполіі яе". ГАРФ, ф. 5875, оп. 1, д. 11, л. 431.

[893] У дакуменце адзначалася, што група К. Езавітава вызначаецца павярхоўным падыходам да беларускай працы і не жадае ачысціць беларускую справу "*ад варожага і шкоднага элемента і, нягледзячы на кадры нацыянальна свядомых беларускіх маладых рэзерваў, лічыць патрэбным супрацоўнічаць нават з асобамі, адкрыта ганьбячымі ўсё беларускае*". У адрозненні ад сваіх апанентаў, аўтары лічылі дадзены прынцып прычынай рэгрэсу беларускай працы і дзеля выпраўлення сітуацыі прапанавалі "*шляхам замены шкоднага элементу маючыміся маладымі рэзервамі, стварэнне можа меншага, але моцнага фронту запраўдных нацыянальна-свядомых працаўнікоў*". Аўтары лічылі, што беларуская праца магла б развівацца больш актыўна, калі б "*для гэтага быў хоць невялічкі лік здольных працаўнікоў, ясна усвядамляючых усю важнасць іхняе працы і ўсю адпавядальнасць, якая на іх ляжыць*". Акрамя таго, аўтары аспрэчвалі інфармацыю А. Цвікевіча аб тым, што ўнутраныя непаразуменні сярод беларусаў выклікаюць насцярогу да беларускай дзейнасці з боку латвійскага ўраду. Аўтары запэўнівалі, што яны карыстаюцца поўным даверам і зразуменнем прадстаўнікоў латвійскай дзяржавы. АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1487–1489.

[894] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1503.

які абараняў К. Езавітава[895]. 18 верасня 1924 г. У. Пігулеўскі пісаў Станіславе Ластоўскай, жонцы Вацлава: "*Хочацца верыць, што Вы можа адна толькі не ўсклалі на сябе абавязку судзіць нас, латгальцаў-беларусаў, і выносіць прыгавор аб маёй 'брыдкай і нясмачнай' ролі*"[896].

Аналізуючы ход палемікі і аргументацыю ўдзельнікаў, можна зрабіць высновы, што прычынай канфлікту былі амбіцыі. Няма сумневу, што І. Краскоўскі не хацеў заставацца толькі дырэктарам гімназіі. У нацыянальным лагеры ён карыстаўся рэпутацыяй дзеяча, адданага беларускай справе, але на перашкодзе да лідарства ў беларускім руху ў Латвіі стаяла адсутнасць латвійскага грамадзянства, а таксама ўплывы пачынальніка мясцовага беларускага руху К. Езавітава і яго прыхільнікаў[897]. Галоўным полем канфлікту былі школы, дзе працавалі прадстаўнікі абодвух бакоў. Каб перахапіць ініцыятыву ў беларускім руху, прыхільнікі І. Краскоўскага намагаліся праводзіць уласную лінію ў дзейнасці беларускай школьнай справы. З гэтым не пагаджаліся К. Езавітаў і С. Сахараў, якія добра арыентаваліся ў спецыфіцы сітуацыі беларускай меншасці ў Латвіі, таму не фарсіравалі "беларусізацыю" навастворaных беларускіх школ. У гэтай сітуацыі "дзвінчукі" абралі шлях канфрантацыі з К. Езавітавым і яго прыхільнікамі.

Беларускі працэс: прычыны, ход, наступствы (1924–1925)

На беларускую культурна-асветную актыўнасць у Латвіі ў разгляданы перыяд паўплывалі падзеі звязаныя з г.зв. беларускім працэсам, якія адбываліся ў 1924–1925 гг. У сувязі з гэтым неабходна асобна разгледзець яго прычыны, ход і наступствы для мясцовага беларускага руху. Шукаючы яго генезісу, неабходна звярнуць увагу на шэраг інцыдэнтаў на тэрыторыі Латгаліі з удзелам прадстаўнікоў мясцовай латвійскай адміністрацыі і беларускіх актывістаў. Адзін з іх адбыўся ў Лудзенскай беларускай гімназіі. На момант ператварэння ўстановы з прыватнай у дзяржаўную ў школьнай касе знаходзілася 319,84 латаў. Гэтую суму кіраўнік гімназіі ахвяраваў таварыству "Бацькаўшчына". Чыноўнікі Міністэрства асветы палічылі гэты ўчынак злоўжываннем, паколькі грошы былі дзяржаўныя, а таварыства толькі ў нязначнай ступені ўтрымлівала школу[898].

---

[895] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1501.

[896] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 56, л. 157.

[897] T. Błaszczak, I. Matiash, D. Michaluk, *Iwan Kraskowski (1880–1955). W służbie Białorusi i Ukrainie*, Białystok 2019, s. 174–175.

[898] К. Казачёнок, *"Белорусский процесс" в Латвии: обвинение, оправдание, наказание*, "Латыши и беларусы: вместе сквозь века. Сборник научных статей", ред. М.Г.Королёв, Минск 2012, с. 40.

Акрамя таго, Міністэрства асветы ставіла ў віну К. Езавітаву парушэнні школьнага заканадаўства ў галіне працы настаўнікаў і выплаты ім (і сабе) заробку[899]. На пачатку 1924 г. у школе была праведзена рэвізія фінансаў, а К. Езавітаў з прычыны растраты дзяржаўных сродкаў, у адпаведнасці з распараджэннем Міністэрства асветы № 1647 ад 14 красавіка 1924 г., быў звольнены з працы (з 15 красавіка)[900]. 25 красавіка 1924 г. С. Сахараў прапанаваў на пасаду кіраўніка гімназіі У. Корці. Аднак у рэшце рэшт выканаўцам абавязкаў кіраўніка быў прызначаны А. Шкульцін[901].

Уласную версію падзей падаў К. Езавітаў, які сцвярджаў, што справа звальнення яго з працы была вынікам таго, што ён парушыў загад міністра асветы дазволіўшы выкладанне ў гімназіі двум настаўнікам-іншаземцам: Р. Плыгаўку і С. Казеку. Ён лічыў, што інцыдэнт быў часткай наступу на беларускія школы, які, на яго думку, мясцовыя чыноўнікі рыхтавалі яшчэ ўзімку 1923 г. На доказ сваёй тэорыі беларускі дзеяч прыводзіў словы міністра асветы Карліса Штраўбергса (*Kārlis Straubergs*), які, нібыта, адзначыў, што "*для гімназіі лепш будзе, калі К. Езавітаў не будзе дырэктарам, бо наспяваюць нейкія здарэнні*"[902]. У адным з лістоў В. Ластоўскаму (7 траўня 1924 г.) К. Езавітаў пісаў: "*У нас ідзе цяперака бойка за самое існаванне нашае аўтаноміі. Дужа насядаюць расейцы, палякі і некаторыя латгальскія партыі. Бадзяюся ў цягніку з Рыгі ў Люцын, з Люцына на Дзвінск, з Дзвінска на Рыгу*"[903].

Справа атрымала розгалас у прэсе. Непрыхільную да беларускіх дзеячаў пазіцыю заняла рыжская газета "Latvis", на старонках якой 6 сакавіка 1924 г. з'явіўся матэрыял пра злоўжыванні кіраўніцтва гімназіі. У наступных нумарах выданне не перастала каментаваць беларускія справы[904]. Беларускія актывісты палічылі гэта пачаткам мэтаскіраванай антыбеларускай кампаніі. У прыватнасці, У. Пігулеўскі адзначаў: "*Нягледзячы на тое, што ў сапраўднасці ніякіх злоўжыванняў не было, што было ўстаноўлена прадстаўніком Дзяржаўнага кантролю і што было аправергнута ў прэсе загадчыкам Беларускага аддзела Міністэрства асветы, гэта зацемка стала пачаткам жорсткага паходу супраць Люцынскай Бел. Гімназіі. Кожны малаістотны*

---

[899] LVVA, 1612 f., 14 apr., 11 l., 55 lp.

[900] LVVA, 1632 f., 2 apr., 493 l., 62 lp.; LVVA, 1612 f., 14 apr., 11 l., 24 lp.

[901] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 23 lp.

[902] Пасля перафармавання ўлетку 1923 г. гімназіі з прыватнай у дзяржаўную, іншаземцам, каб працаваць у ёй, патрабаваўся дазвол Рада міністраў. Міністэрства двойчы – 25 кастрычніка і 11 снежня 1823 г. – адмовілася даць дазвол. Насуперак гэтаму, дырэктар гімназіі палічыў, што атрыманне Р. Плыгаўкам і С. Казекам латвійскага грамадзянства з'яўляецца справай найбліжэйшага часу, таму дазволіў ім працаваць далей. К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, Рыга 1927 [перадрук: Нью-Ёрк – Менск 2013, с. 105–106.

[903] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1517.

[904] ГАРФ, ф. 5875, оп. 1, д. 7, л. 30–32.

факт з жыцця гэтай гімназіі атрымоўваў яўна тэндэнцыйную афарбоўку. Разбіў вучань акно – гэта тлумачылася дапушчэннем да гімназіі педагогаў-іншаземцаў, ненаўмысна вучань прастрэліў нагу – гэта знаходзіла такое ж дзіўнае тлумачэнне. У выніку загадчык гімназіі г. К. Езавітаў быў адхілены ад дзейнасці"[905].

Трэба адзначыць, што ў архіўных крыніцах латвійскіх дзяржаўных органаў нам не ўдалося знайсці доказаў існавання ва ўрадавых колах запланаванай антыбеларускай акцыі. У сувязі з гэтым, можна лічыць, што абвінавачанні беларускіх дзеячаў хутчэй за ўсё былі беспадстаўнымі. Разам з тым варта падкрэсліць, што ў 1924 г. латвійскія ўлады пачалі заўважаць, што некаторыя прадстаўнікі беларускай меншасці праяўляюць сепаратысцкія тэндэнцыі, якія раней былі ўласцівыя польскаму руху. У органах улады расло пачуццё, што беларускі рух у Латвіі можа быць не толькі супрацьвагай у дачыненні да мясцовых палякаў і рускіх, але і сам у будучыні ствараць пагрозу тэрытарыяльнай цэласнасці латвійскай дзяржавы[906].

Такія настроі ўзмацнілі інцыдэнты, які адбыліся ў беларускіх школах Даўгаўпілшчыны. 20 сакавіка 1924 г. інспектар народных школ Даўгаўпілскага павета Лукс Азоліньш (*Lūks Ozoliņš*) правёў інспекцыю ў беларускіх школах Капінскай воласці. Падчас рэвізіі навучальных матэрыялаў у Дудэльскай беларускай школе ён знайшоў мапу Беларусі, на якой было пазначана, што ў яе межах знаходзяцца Латгалія і Ілукшчына. Мапа была канфіскаваная і перададзеная ў Агульны школьны дэпартамент як недапушчальная ў школьнай працы. Кіраўнік школы патлумачыў, што мапа была атрымана з Беларускага аддзела. 22 сакавіка інспектар Л. Азоліньш правёў інспекцыю ў беларускай школе ў Станкевічах, дзе знайшоў такую ж мапу. У выніку следчых прац было высветлена, што крамольная мапа была выдадзена ў 1919 г. у Вільні, а ў сакавіку 1922 г. К. Езавітаў перадаў яе настаўнікам некаторых беларускіх школ. Пазней пэўную колькасць асобнікаў мапы набыў Беларускі школьны аддзел, са згоды якога яна выкарыстоўвалася ў шэрагу беларускіх школ у Латвіі. Беларускія дзеячы тлумачылі, што мапа выкарыстоўвалася ў школах, паколькі яна адлюстроўвала не дзяржаўныя межы Беларусі, а этнаграфічны абшар рассялення беларусаў. У сувязі з гэтым, на ёй чырвоным колерам была пазначана дзяржаўная мяжа Латвіі. Праўда, на асобніку, знойдзеным у Дудэльскай школе, гэтыя змены адсутнічалі. Кастусь Езавітаў тлумачыў, што мапу набыў настаўнік Сцяпан Махноўскі, які не паспеў нанесці адпаведных змен. Ён лічыў гэтую справу чыста фармальнай і сцвярджаў, што не

---

[905] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1526; БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 56, л. 60.

[906] Э. Екабсонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [в:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 52.

належыць ёй надаваць вялікай увагі, бо мапа без пазначаных дзяржаўных межаў Латвіі знаходзілася толькі ў адной школе. На яго думку, дастаткова было даць вымову дырэктару школы за недагляд[907].

Аднак справа атрымала гучны працяг. Павятовае школьнае кіраўніцтва Даўгаўпілшчыны і Лудзеншчыны вырашыла працягнуць інспекцыю ў іншых беларускіх школах. Падчас чарговай рэвізіі ў школьных бібліятэках былі знойдзены паштоўкі БНР, якімі карысталіся вучні. У аднаго з вучняў Лудзенскай беларускай гімназіі была знойдзена паштоўка з абрысамі межаў БНР, у якіх знаходзіўся Даўгаўпілс. Беларускі бок зноў мусіў тлумачыць з'яўленне сумнеўнага матэрыялу ў школьных мурах. Кастусь Езавітаў сцвярджаў, што паштоўка была выдадзена ў Менску ў сакавіку 1918 г., яшчэ да абвяшчэння незалежнасці Латвіі і вызначэння яе дзяржаўных межаў. Латвійскі бок палічыў гэтыя аргументы недастатковымі, таму Агульны школьны дэпартамент перадаў паштоўку ў пракуратуру, дзе яна стала прадметам следства. Пракурор у Рызе запатрабаваў рэвізіі справаводства Беларускага школьнага аддзела. За правядзенне апошняй адказваў віцэ-дырэктар Агульнага школьнага дэпартамента Петэрыс Заліціс (*Pēteris Zālītis*)[908].

Справа прыцягнула ўвагу прэсы. На старонках некаторых рускамоўных выданняў з'явілася інфармацыя пра фінанасавыя злоўжыванні ў Лудзенскай беларускай гімназіі і выкарыстанне ў беларускіх школах забароненай мапы. Беларускі актыў намагаўся перашкодзіць пашырэнню гэтай інфармацыі. 15 красавіка 1924 г. на пасяджэнні педрады Лудзенскай беларускай гімназіі было прынята рашэнне прыцягнуць да адказнасці аўтараў шкодных беларусам зацемак[909]. У сваю чаргу кіраўнік Беларускага школьнага аддзела 24 красавіка 1924 г. накіраваў ліст галоўнаму рэдактару газеты "Сегодня" інфармуючы, што дзяржаўныя органы не знайшлі ніякіх злоўжыванняў у Лудзенскай гімназіі, а знойдзеная мапа мае этнаграфічны, а не палітычны характар[910]. Нягледзячы на гэта, рускамоўнае выданне "Рижский курьер" надрукавала артыкул скіраваны як супраць беларускага руху, так і супраць К. Езавітава ў прыватнасці. Пры гэтым аўтар свядома ці несвядома спаслаўся на непраўдзівыя звесткі пра тое, што мапа Беларусі была знойдзена ў Лудзенскай беларускай гімназіі, а К. Езавітаў адхілены ад кіравання гэтай школай па асабістым распараджэнні міністра асветы ў сувязі з грашовымі растратамі[911]. У выніку кіраўнік БША звярнуўся да галоўнага рэдактара з патрабаваннем надрукаваць абвяржэнне[912]. Адначасова кіраўніцтва Беларускага школьнага

---

[907] К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, Рыга 1926 [перадрук: Нью-Ёрк – Менск 2013], с. 106.

[908] Тамсама, с. 107.

[909] LVVA, 212 f., 5 ap., 9690 l., 43 lp.

[910] LVVA, 212 f., 5 ap., 9690 l., 43–44 lpp.

[911] *Белоруссы оправдываются*, "Рижский курьер" 1924, № 982 от 26 апреля, с. 3.

[912] LVVA, 2125 f., 5 apr., 106 l., 22 lp.

аддзела рабіла захады, каб выключыць са школьнага выкарыстання мапы, на якіх не былі пазначаныя дзяржаўныя межы Латвіі. Праблема заключалася ў тым, што на тых мапах, якія разаслалі па школах Лудзеншчыны супрацоўнікі БША, былі нанесены межы Латвіі, а на тых, якія К. Езавітаў асабіста выслаў у школы Даўгаўпілшчыны, яны маглі адсутнічаць[913]. У сувязі з гэтым 16 красавіка 1924 г. Беларускі школьны аддзел разаслаў цыркуляр кіраўнікам беларускіх школ, загадаўшы як мага хутчэй праверыць наяўныя мапы і паінфармаваць аб тым, якім чынам і аб каго яны атрыманыя[914].

Тым часам, у перыяд з 24 красавіка па 15 траўня 1924 г. Палітычнае ўпраўленне паліцыі правялі інспекцыю ў беларускіх гімназіях і ва ўсіх беларускіх пачатковых школах на Даўгаўпілшчыне. Захаваліся даволі падрабязныя звесткі пра ход паліцэйскіх вобшукаў у беларускіх школах. Вядома, што 24–26 красавіка паліцыя правяла вобшук у беларускіх настаўнікаў Даўгаўпілса і ў канцылярыі гімназіі. У перыяд з 1 па 5 траўня вобшук прайшоў ва ўсіх беларускіх настаўнікаў Даўгаўпілскага павета. У наступныя дні (7 і 8 траўня) быў зроблены яшчэ адзін вобшук у Даўгаўпілскай беларускай гімназіі. З 10 па 12 траўня адбыўся вобшук ва ўсіх беларускіх настаўнікаў Лудзы і ў Лудзенскай беларускай гімназіі. Уначы з 15 на 16 траўня быў зроблены трэці вобшук у Даўгаўпілскай беларускай гімназіі. Падчас ператрусу прысутнічаў дырэктар І. Краскоўскі, які, паводле відавочцаў, "падвяргаўся грубым абразам і здзекам". Пасля вобшуку ў будынку гімназіі застаўся паліцыянт. Ён не пусціў у клас вучняў беларускай пачатковай школы, якія прыйшлі на ранішнія заняткі. Ператрус адбыўся таксама ў памяшканнях, дзе жылі настаўнікі К. Езавітаў, М. Іваноў, С. Казека, П. Мядзёлка-Грыб, М. Талерка, А. Якубецкі, а таксама У. Пігулеўскі[915].

У выніку вобшукаў 3 траўня ў Талаеўскай і Дудэльскай школах была знайдзена вышэйзгаданая мапа. Настаўнікі мусілі тлумачыць, адкуль яна ўзялася. Кіраўнік Дудэльскай школы С. Махноўскі ў лісце на імя кіраўніка Беларускага школьнага аддзела (13 траўня 1924 г.) падкрэсліваў, што наяўнасць мапы не стварала ніякіх праблем, паколькі яна адлюстроўвала толькі межы рассялення беларусаў, а побач з ёй вісела мапа Латвійскай Рэспублікі, на якой былі пазначаны дзяржаўныя межы[916]. Падчас вобшукаў 8 і 15 траўня ў мурах Даўгаўпілскай беларускай гімназіі паліцыя знайшла тры асобнікі падручніка па геаграфіі Беларусі А. Смоліча і *Biełaruski kalendar «Našaje niwy" na 1918 hod* (Вільня 1917). Следчыя звярнулі ўвагу на апошняе выданне з тае прычыны, што ў ім была згадка аб межах Беларусі, якія вызначае беларуская

[913] LVVA, 2125 f., 5 apr., 256 l., 89 lp.
[914] LVVA, 2125 f., 5 ap., 72 l., 8 lp.
[915] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 56, л. 62.
[916] LVVA, 212 f., 5 ap., 9690 l., 64 lp.

мова. Паліцыю зацікавіла таксама кніга К. Езавітава *Белоруссы и поляки* (Коўна 1919), у якой аўтар пісаў, што беларусам не даводзіцца разлічваць на вонкавую дапамогу, таму заклікаў да ўзброенага змагання і пашырэння нацыянальнай працы сярод насельніцтва. Акрамя таго, паліцыя канфіскавала статут менскага таварыства "Бацькаўшчына" (Менск 1918) і асобнікі ковенскага часопіса "Крывіч", на старонках якога асвятлялася справа аб'яднання беларускіх этнаграфічных земляў у БССР. Паколькі знойдзеныя дакументы былі па-беларуску, палітычная паліцыя запатрабавала ад беларускіх настаўнікаў іх перакласці, аднак, не атрымаўшы згоды, скіравала матэрыял у Латгальскі акруговы суд[917]. Адначасова з ператрусамі ў школах была праведзеная рэвізія сродкаў БША, паколькі Міністэрства асветы жадала ведаць ці атрыманае з дзяржаўнага бюджэту фінансаванне выкарыстоўвалася паводле прызначэння. Праверка не знайшла парушэнняў у фінансавай палітыцы Беларускага школьнага аддзела[918].

Падчас вобшуку следчыя склалі спіс беларускамоўных выданняў, якія захоўваліся ў беларускіх школах. У пераліку з 94 адзінак знаходзіліся літаратурныя творы і дыдактычная літаратура[919]. Па выніках вобшукаў Палітычнае ўпраўленне паліцыі ў Даўгаўпілсе пачаў допыты настаўнікаў беларускіх школ. Спачатку 16 траўня на допыты былі выкліканыя настаўнікі з Даўгаўпілшчыны, а 24–26 траўня прыйшла чарга іх калег з Лудзеншчыны. Варта дадаць, што крыху раней (22 траўня) быў звольнены з дзяржаўнай службы К. Езавітаў[920]. З гэтага часу ён лічыўся работнікам асветы і быў адхілены ад выканання сваіх абавязкаў да моманту высвятлення справы[921]. Ужо 24 траўня лудзенскі аддзел палітычнай паліцыі выклікаў на допыты першых вучняў Лудзенскай беларускай гімназіі: Трубецкага, Браніслава Юрэвіча, Яна Кудраўцова, Сідарава, Дабравольскага, Валянціну Казлоўскую і іншых[922]. Захаваліся даволі супярэчлівыя паведамленні пра тое, як праходзілі гэтыя гутаркі. Адзін з удзельнікаў падзей У. Пігулеўскі сцвярджаў, што допыты адбываліся ў атмасферы запалохвання і маральных здзекаў з боку начальніка аддзела палітычнай паліцыі ў Даўгаўпілсе Герберта Эйнберга і чыноўніка МУС Францыса Петрыньша, якія рабілі абразлівыя заўвагі. Следчыя дазвалялі сябе выказванні, накшталт: "Ні беларускай культуры, ні беларускай мовы няма і не будзе", "я даю вам шчырае слова латышскага ўрадоўца, што вас праз 2 тыдні вышлюць з Латвіі",

---

[917] LVVA, 3235 f., 1/22 apr., 380 l., 187 lp.; *Беларускі працэс у Латвіі*, "Голас беларуса" 1925, № 5 ад 17 ліпеня, с. 2–3.

[918] LVVA, 2125 f., 5 apr., 106 l., 3 lp.

[919] LVVA, 1612 f., 14 apr., 10 l., 231 lp.

[920] LVVA, 5213 f., 16 apr., 16514 l., 3 lp.

[921] LVVA, 1632 f., 2 apr., 493 l., 72 lp.

[922] LVVA, 2125 f., 5 apr., 251 l., 76 lp.

“я запэўніваю вас, што Латвійскі сойм не прыме вашага бюджэту” і г.д. Беларускі дзеяч сцвярджаў, што следчыя задавалі правакацыйныя пытанні. Накшталт – “хто вас пераканаў, што вы беларус”, “з якога часу вы лічыце сябе беларусам”, “ці размаўляеце вы па-беларуску”, “на якой мове размаўляюць у вас у хаце”, “чаму вы лічыце сябе беларусам”, “ці падабаецца вам беларуская мова” і г.д. У. Пігулеўскі лічыў, што такім чынам следчыя намагаліся дыскрэдытаваць беларускі нацыянальны рух у Латвіі[923]. Далей ён пісаў: “*Справа набрала новага абароту, калі ёй занялася палітычная паліцыя. Пасля 15/V пачаліся дапросы ўсіх у Палітычнай Ахране ў Дзвінску, спецыяльным урадоўцам Міністэрства Унутр. Спраў. Падчас допытаў настаўнікаў абражаліся іх нацыянальныя пачуцці, урадоўцы страшылі іх дэпартацыяй, задавалі інтымныя пытанні*”[924]. Ва ўмовах адсутнасці іншых крыніц складала пацвердзіць або аспрэчыць праўдзівасць слоў беларускага дзеяча.

Следства супраць беларускіх актывістаў прыцягнула ўвагу прэсы. Адзін з падсудных У. Пігулеўскі наступным чынам падсумаваў стаўленне да следства над беларусамі: “*Расейцы, палякі і частка чорнай латвійскай сотні – лікуе, такая самая частка латышоў за нас грызецца, а рэшта чакае*”[925]. Увесну 1924 г. у латышскамоўных і рускамоўных выданнях з’явіўся шэраг публікацый, аўтары якіх пісалі, што ў беларускіх школах выкарыстоўваюцца нацыяналістычныя мапы, якія ствараюць пагрозу далучэння да Беларусі Даўгаўпілскага, Лудзенскага, Рэжыцкага і Ілукштанскага паветаў. Гучныя словы ў інфармацыйнай прасторы не спрыялі змяншэнню напружанасці, а наадварот стваралі атмасферу падазронасці ў грамадстве. Вось якім чынам ролю СМІ ў падагравanні настрояў характарызаваў К. Езавітаў: “*У звязку з соймавымі гутаркамі аб беларускім бюджэце, а таксама з рэвізіяй у Беларускім аддзеле і вобыскамі ў беларускіх школах Даўгаўпілскага павета, газетная шуміха наўкол беларусаў не сціхала, а наадварот павялічвалася ўсе больш і больш. Некаторыя з зарваўшыхся газетных пісакаў, асабліва ў расейскай газеце ‘Рижский курьеръ’, не спыняліся перад самай ашуканскай брахнёй. Беларускія дзеячы пачалі бараніцца, накіроўваючы ў прэсу свае артыкулы, аднак большая частка іх так і не была надрукавана. Пад уплывам беларускіх пратэстаў у некаторых кіруючых латышскіх газетах пасля ўсялякіх сенсацыйных чутак з’явіліся, нарэшце, і вялікія артыкулы, прысвечаныя разгляду беларускага пытання. У гэтых артыкулах аўтары, з аднаго боку, нібыта вызнаюць безумоўнае права беларускае меншасці на нацыянальна-культурную аўтаномію і падкрэсліваюць, што не жадаюць, каб беларусы адчувалі сябе ў Латвіі пакрыўджанымі, як гэта было ў старой*

[923] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1530; БДАМЛіМ, Ф. 3, воп. 1, спр. 56, л. 27, 65–66.

[924] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1527; БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 56, л. 24, 62–63.

[925] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 56, л. 40.

Расеі, або як ёсць у сучаснай Польшчы, але, з другога боку, усе аўтары выказывалі палахлівую думку аб магчымасці 'чырвоных' уплываў на беларускую меншасць з-за ўсходняе мяжы, з умацаваўшайся Савецкай Беларусі, а таму радзяць уладам у Латгаліі пільна сачыць за настроямі беларускае меншасці і прымаць у выпадку патрэбы рашучыя крокі. Нямаль кожная такая стацыя абавязкова заканчвалася сумаваннем аб тым, што на ўсходзе Латгаліі ёсць яшчэ воласці, дзе толькі па адной латышскай школе, а ўсе іншыя школы – беларускія. Аўтары знаходзілі гэта ненармальным і дамагаліся, каб лічба латышскіх школ у гэтых беларускіх валасцёх была павялічана"[926].

Побач з рускамоўным "Рижским Курьером" найбольш зацята беларускіх дзеячаў атакавала латвійскае выданне правага ўхілу "Latvis" і латгальская гезета "Latgalietis", шэраг іншых выданняў. Вышэйзгаданы У. Пігулеўскі лічыў, што на старонках гэтых перыёдыкаў, пачынаючы з сакавіка 1924 г., вёўся "запланаваны паход супраць беларусаў". Латвійскі даследчык Марыс Голдманіс лічыць, што беларусы трапілі пад крыжовы агонь пэўных уплывовых палітычных сіл, у задуме якіх следства павінна было стаць перасцярогай для іншых нацменаў[927]. Гэта тлумачыць факт, што ў кампаніі па дыскрэдытацыі беларускага актыву брала ўдзел партыйная прэса правай плыні. 11 красавіка 1924 г. на старонках газеты "Brīvā Zeme" з'явілася зацемка аб тым, што ў адной з беларускіх школ на Даўгаўпілшчыне была знойдзена мапа, на якой частка Латвіі пазначалася як Беларусь. Аўтары некаторых публікацый праводзілі думку пра "сумнеўныя" сувязі кіраўнікоў латвійскіх беларусаў з дзеячамі БНР на чужыне. У прыватнасці, у газеце "Brīvā Zeme", у № 97 ад 30 красавіка 1924 г. з'явіўся артыкул пад назвай "Заслугі Аддзела беларускіх школ", у якой чытаем: "*У сувязі з паднятым пытаннем аб мапах 'Беларускай Дзяржавы', знойдзеных у пачатковай школе Ілукштанскага павета, нам пішуць: гэтыя весткі трэба папоўніць тым, што памянутыя мапы знаходзяцца ва ўсіх беларускіх школах. На мапах Ілукштанскі павет, Дзвінск з часткай павета, большая частка Люцынскага павета з горадам з'яўляюцца часткай 'Беларусі'. Сучасная Літоўская тэрыторыя ў 'Беларусі' не лічыцца, таксама як не акрэслена Літоўска-Польская мяжа. У беларускія школы прыходзіць з Літвы запас часопісі 'Крывіч', у якім вядзецца агітыцыя за стварэнне 'Беларусі' з памянёнымі складнымі часткамі Латвіі. У ім супрацоўнічае 'наш' інспектар пачатковых школ і дырэктар Гімназіі Езавітаў, як 'вайсковы спецыяліст', пішучы аб 'Беларускай вайсковай Радзе'. Можа,*

---

[926] К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, Рыга 1927 [перадрук: Нью-Ёрк – Менск 2013], с. 108.

[927] М. Голдманис, *"Белорусский" доскурс в латышской прессе (1920–1934): эволюция представления о белорусах как о самостоятельном национальном меншинстве*, "Латыши и беларусы: вместе сквозь века", Минск 2016, № 5, с. 73.

у будучым нумары ён будзе пісаць аб стратэгічным значэнні Дзвінска для 'Беларусі', чаму ж тады, згодна з гэтай 'Картаю', павінны будуць вучыцца ў нашых школах. Аддзел беларускіх школ (...) дапамогі для антыдзяржаўнай агітацыі, але аб прыбліжэнні сваіх вучыцялёў і дзяцей да латышскай культуры – аб гэтым ён не думае. (...) Няўжо Міністэрства прасветы дае права карыстацца ў школах замежнай перыядычнай літаратурай"[928].

У падобным тоне быў вытрыманы артыкул пад назвай "Адкрыццё змовы ў Латагаліі", які выйшаў 15 траўня 1924 г. на старонках газеты "Latvijas sargs". У ім аўтар пераконваў, што палітычная паліцыя трапіла на след "*беларускай манархісцкай арганізацыі, якая ўжо запусціла карані ў Латгаліі і разгарнула сваю дзейнасць у Латвіі да пагрозлівых памераў*"[929]. У артыкуле сцвярджалася, што беларускія манархісты ўтрымліваюць адносіны з ген. Пятром Урангелем і штабам князя Мікалая Мікалаевіча, стварылі свае ўласныя ўзброеныя аддзелы і ўсталявалі сувязі з мясцовым сялянствам. Паводле аўтара публікацыі, у Латвіі дзейнічала ажно некалькі беларускіх груповак (манархісты, камуністы, федэралісты, незалежнікі), якія займаліся антыдзяржаўнай працай[930]. Артыкулы падобнага зместу з'яўляліся таксама ў рускамоўнай прэсе па-за межамі Латвіі. Напрыклад, газета "Русская жизнь" (выходзіла ў Сан Францыска) 29 траўня 1924 г. надрукавала артыкул *Латгальские сепаратисты*, у якім паведамляла пра разгром латвійскай паліцыяй патаемнай арганізацыі беларускіх сепаратыстаў на чале з К. Езавітавым, якая ставіла за мэту супрацоўніцтва з Савецкай Расіяй і стварэнне беларускай дзяржавы з далучэннем да яе Латгаліі. Беларускі бок намагаўся рэагаваць на абвінавачанні ў прэсе. Напрыклад, К. Езавітаў прасіў В. Ластоўскага звярнуцца ў латвійскае пасольства ў Коўне, каб яно афіцыйна абвергла інфармацыю аб тым, што, нібыта, ковенскія беларускія дзеячы дапамагаюць латгальскім беларусам у адарванні Даўгаўпілшчыны ад Латвіі[931].

У латвійскай інфармацыйнай прасторы гучалі галасы, якія можна лічыць прыязнымі ў дачыненні да беларусаў. Узважаным і памяркоўным стылем складзеная публікацыя *Беларускі нацыяналізм і Балтыйская палітыка*, якая выйшла 18 чэрвеня 1924 г. на старонках выдання "Jaunākās ziņas". Аўтар не аспрэчваў існавання сярод беларусаў антыдзяржаўных сіл, але пры гэтым заклікаў не рабіць заўчасных высноў да сканчэння следства. Адначасова ён перасцерагаў улады ад неразважлівых і неабачлівых захадаў, паколькі разам з "*пустазеллем можна вырваць таксама добрыя расліны і гэтым самым канчаткова скампраметаваць беларускую школьную*

[928] Цыт. за: БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 56, л. 29.
[929] Цыт. за: БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 56, л. 57.
[930] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 56, л. 57–58.
[931] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 56, л. 30.

аўтаномію”[932]. Аўтар падкрэсліваў неабходнасць будаваць сяброўскія адносіны з беларускай меншасцю, каб прышчапіць ёй шчырую сімпатыю да латвійскай дзяржавы. Ён вітаў палітыку ў дачыненні да беларусаў у першыя гады незалежнасці Латвіі, калі беларуская меншасць атрымала правы, якіх не мела ў суседніх краінах. У артыкуле чытаем: “*У нас, здаецца, усё ішло гладка, па нармальным шляху. Дзвінскія беларускія школы знаходзіліся нават у Рызе і выступалі са спектаклем у нацыянальным тэатры. Вучні з натхненнем спявалі латвійскі нацыянальны гімн. Здавалася, што гэта робіцца для нас той меншасцю, якая, магчыма, адзіная ад шчырага сэрца добразычліва ставіцца да Латвіі. Можна ўявіць, як былі ашаломленыя сябры чыстага нацыяналізму беларусаў, калі пачаліся ў іх школах бязлітасныя арышты настаўнікаў у Даўгаўпілсе і іншых месцах Латаглії*”[933].

Неабходнасць падтрымкі беларускага руху аўтар тлумачыў бягучай міжнароднай сітуацыяй. Ён сцвярджаў, што ў сітуацыі няўстойлівага геапалітычнага становішча паміж Захадам і Усходам латвійская дзяржава мусіць шукаць хаўруснікаў у рэгіёне. На думку аўтара, найбліжэй да латышоў стаяць менавіта беларусы, з якімі балтаў яднае супольны гістарычны лёс. Аўтар лічыў, што нельга недаацэньваць патэнцыял беларускага фактару ў міжнародных справах, паколькі здаровы беларускі нацыяналізм можа быць натуральным хаўруснікам Латвіі. Адначасова ён выказаў думку, што неабдуманая крыўда, зробленая беларускай меншасці, пашкодзіць падмуркі латвійска-беларускага сяброўства. Падагульняючы, аўтар адзначаў: “*Паўстрымоўваючыся ад канчатковых высноў наконт афарбоўкі беларускага нацыянальнага руху, мы, аднак, лічам неабходным звярнуць увагу, што ўрад не павінен выпускаць з рук ніводнай ніткі, якая магла б павялічыць на ўсходнім узбярэжжы Балтыйскага мора агульную вагу нарастаючых палітычных сіл. І да такіх, на наш погляд, належыць сяброўскі Латвіі чысты беларускі нацыяналізм. Калі такога яшчэ не было і ён быў скампраметаваны злачыннымі элементамі, дык у будучыні не варта складаць рукі на каленях, а трэба спрыяць развіццю беларусізму*”[934]. З беларусамі салідарызаваўся лінгвіст Эрнэстс Блезе (*Ernests Blese*), які ў 1925 г. надрукаваў артыкул пра самабытнасць беларускай мовы і культуры, а таксама пагрозу для яе з боку суседзяў – рускіх і палякаў[935].

Супраць беларускіх дзеячаў была распачатая крымінальная справа па артыкулах 5(I), 102 (I), 124 (II-2, 3), 129 (I-4) і 130 (I-4) Крымінальнага кодэкса

---

[932] Цыт. за: БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 56, л. 56.

[933] Цыт. за: БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 56, л. 55–56.

[934] Цыт. за: БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 56, л. 56.

[935] М. Голдманис, *“Белорусский” доскурс в латышской прессе (1920–1934): эволюция представления о белорусах как о самостоятельном национальном меншинстве*, “Латыши и беларусы: вместе сквозь века”, Минск 2016, № 5, с. 74.

Латвіі. Першапачаткова ў абвінаваўчым акце фігуравалі 25 беларускіх настаўнікаў, у тым ліку кіраўнік Беларускага школьнага аддзела. Аднак Латгальскі акруговы суд падтрымаў абвінавачанні ў дачыненні да 15 беларусаў: Кастуся Езавітава, Уладзіміра Пігулеўскага, Івана Краскоўскага, Паўліны Мядзёлкі-Грыб, Міхася Іванова, Уладзіміра Корці, Парфірыя Жэрдзі, Сяргея Казекі, Сяргея Сахарава, Мікалая Талеркі, Якуба Кастылюка, Алеся Махноўскога, Алены Сушынскай, Люцыі Габран, Эдварда Вайводзіша[936]. Апошні абвінавачваўся ў спробах прымусовай беларусізацыі вучняў сваёй школы і спрыянні антыдзяржаўнай агітацыі[937]. У канчатковым выніку абвінавачанне ў антыдзяржаўнай дзейнасці было выстаўлена толькі васьмі асобам – К. Езавітаву, А. Якубецкаму, І. Краскоўскаму, П. Мядзёлцы-Грыб, У. Корці, П. Жэрдзі, М. Іванову і У. Пігулеўскаму. Першым (22 траўня) быў арыштаваны К. Езавітаў, а 13 і 14 чэрвеня – астатнія фігуранты справы. Сярод фігурантаў толькі чатыры (К. Езавітаў, У. Корці, У. Пігулеўскі, М. Іваноў) з'яўляліся латвійскімі грамадзянамі, трое (А. Якубецкі, Я. Краскоўскі, П. Мядзёлка-Грыб) мелі літоўскае падданства, адзін (П. Жэрдзі) лічыў сябе ўкраінскім грамадзянінам. Міністр унутраных спраў выдаў распараджэнне пра выдаленне з Латвіі ў адміністрацыйным парадку настаўнікаў, якія не мелі латвійскага грамадзянства. Аднак у сувязі з тым, што справу перадалі ў Латгальскі акруговы суд, працэдура дэпартацыі была прыпыненая[938].

За кратамі апынулася самая актыўная частка таварыства "Бацькаўшчына" і беларускага настаўніцтва ў Латгаліі, у тым ліку кіраўнікі гімназій у Лудзы і Даўгаўпілсе. Усіх арыштаваных трымалі ў Даўгаўпілскай турме. Пасля двух- ці трохдзённых допытаў былі вызваленыя пад заруку: І. Краскоўскі (15 000 рублёў), А. Якубецкі, У. Корці, У. Пігулеўскі (па 10 000 рублёў), П. Мядзёлка-Грыб, М. Іваноў і С. Казека (па 5 000 рублёў). Мера стрымання ў выглядзе турэмнага арышту была захавана толькі ў дачыненні да К. Езавітава, які знаходзіўся за кратамі амаль 11 месяцаў (быў вызвалены 3 красавіка 1925 г.). Канчатковы акт абвінавачвання быў падрыхтаваны 4 снежня 1924 г.[939] Беларускія дзеячы абвінавачваліся ў тым, што яны, як "злачынны саюз беларусаў", "*з 7 лістапада 1922 года па красавік 1924 года ў Латгаліі ўдзельнічалі ў свядомай дзейнасці, у якой ставілі сабе за мэту прымусам адарваць ад латвійскай дзяржаўнай тэрыторыі Даўгаўпілскі, Рэжыцкі, Лудзенскі і часткова таксама Ілукштанскі паветы і далучыць іх*

---

[936] Э. Екабсонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [в:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 53.

[937] LVVA, 3235 f., 2 apr., 4648 l., 50 lp.

[938] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1527–1529; БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 56, л. 39–40.

[939] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 58 lp.

да Беларусі. З такой мэтай яны ўступалі ў сувязі з рознымі арганізацыямі за мяжой, у тым ліку і ў Празе, якія паставілі сабе такую ж мэту, распаўсюджвалі друкаваныя геаграфічныя мапы, на якіх частка тэрыторыі Латвіі была ўключана ў тэрыторыю Беларусі, распаўсюджвалі падручнікі па геаграфіі для школьнікаў і іншых асоб, а таксама вучылі на занятках школьнікаў, што Латвія сілком захапіла частку тэрыторыі Беларусі, якая ў бліжэйшай будучыні будзе адарваная, распаўсюджвалі часопіс 'На чужыне', які ўтрымліваў заклік да беларускіх жыхараў са зброяй у руках устаць на барацьбу супраць тых, хто падзяліў беларускую дзяржаву, сярод іх і ўраду Латвіі"[940].

Больш падрабязнага разгляду патрабуюць аргументы абвінаваўчага боку. Следства вялі Герберт Эйнберг і Франціс Петрыньш з Палітычнага ўпраўлення паліцыі, следчы па асабліва важных справах Саўкумс, пракурор Латгальскага акруговага суда Карліс Скадунс і яго памочнік Аўгустс Лукіньш. Ход следства і працэсу падрабязна быў пададзены ў беларускіх крыніцах, якія, аднак, утрымліваюць тэндэнцыйныя звесткі наконт следчых метадаў, якія выкарыстоўваліся ў дачыненні сведкаў-беларусаў. Разам з тым нельга сказаць, што следчыя займалі заведама антыбеларускую пазіцыю. Сведчаць пра гэта наступныя факты. Супраць беларускіх дзеячаў сведчылі некаторыя настаўнікі-рускія, якія надзвычай адмоўна ставіліся да беларускага руху. Сваёй антыпатыі да беларусаў яны не хавалі падчас працэсу. Следчыя ведалі пра гэта, таму намагаліся крытычна ставіцца да іх сведчанняў. 16 чэрвеня 1924 г. латгальскі аддзел палітычнай паліцыі атрымаў ананімнае паведамленне, што група нямецка-рускага саюза манархістаў плануе знішчыць матэрыялы справы К. Езавітава, а ў выпадку немагчымасці– арганізаваць яго ўцёкі ў Нямеччыну. Аднак следчыя палічылі інфармацыю правакацыяй, таму не ўзялі яе пад увагу[941]. Следчыя шукалі доказаў сувязі К. Езавітава і іншых беларускіх дзеячаў з камерцыйнымі коламі, а таксама замежнымі цэнтрамі[942].

У аснову абвінавачання лягла перакананне, што ў Латвіі дзейнічала беларуская арганізацыя, якая імкнулася да стварэння незалежнай беларускай дзяржавы, у межах якой павінны былі апынуцца Даўгаўпілскі, Лудзенскі, Рэжыцкі і часткова Ілукштанскі паветы Латвіі. Паводле абвінаваўцаў, беларускія дзеячы праводзілі нацыяналістычную і сепаратысцкую працу сярод настаўнікаў і вучняў беларускіх школ шляхам распаўсюду друкаванай

---

[940] Цыт. пав.: М. Друговейко, *"Преступный союз белорусов" в Латгалии (1924–1925 год) в документах Латвийского государственного исторического архива Национального архива Латвии*, "Przegląd Środkowo-Wschodni" 2025, nr 10, s. 191 (у друку).

[941] К. Казачёнок, *"Белорусский процесс" в Латвии: обвинение, оправдание, наказание*, "Латыши и беларусы: вместе сквозь века. Сборник научных статей", ред. М.Г.Королёв, Минск 2012, с. 34.

[942] LVVA, 1612 f., 14 apr., 11 l., 51 lp.

прадукцыі і прэсы, а таксама праз палітызацыю заняткаў[943]. Падазрэнні следчых выклікалі кантакты лідараў латвійскіх беларусаў з аднадумцамі за межамі Латвіі. У прыватнасці, увагу паліцыі прыцягнуў ліст (8 жніўня 1925 г.) аднаго з лідараў беларускага жыцця ў Коўне да У. Пігулеўскага. Яго аўтар дзяліўся планамі склікання "Агульнабеларускай Канферэнцыі за кардонам", да ўдзелу ў якой запрашаў прадстаўнікоў беларусаў Латвіі[944]. Паліцыя палічыла гэты ліст доказам існавання ў Латвіі "беларускай калоніі", якая з'яўляецца часткай замежнай палітычнай сеткі[945]. На думку пракурора А. Лукіньша, аўтары школьнага выдання Лудзенскай гімназіі "Ластаўка" заклікалі моладзь да змагання за Беларусь да апошняй кроплі крыві. Акрамя таго, абвінаваўцам не падабалася выкарыстанне ў беларускіх школах у 1922/23 гг. такіх выданняў, як: *Беларускі каляндар на 1922 год*, у якім адзначалася, што да Беларусі належыць Віцебская губерня; праца М. Доўнар-Запольскага *Асновы беларускай дзяржаўнасці*; часопіс "На чужыне". Следства вызначыла, што гэтая літаратура была даступная настаўнікам і вучням беларускіх школ, а таксама курсантам беларускіх настаўніцкіх курсаў, паколькі яна знаходзілася ў школьных бібліятэках, выкарыстоўвалася падчас заняткаў з вучнямі і курсантамі, а таксама пашыралася сярод насельніцтва. Асаблівай увагі следчых заслугоўвала выкарыстанне ў беларускіх школах падручніка А. Смоліча *Геаграфія Беларусі*. Падчас следства было высветлена, што за пасрэдніцтвам настаўніцы Клары Багінскай у школы трапіла каля 50 асобнікаў выдання. Акрамя таго, абвінаваўцы ведалі, што падручнік выкарыстоўваўся на настаўніцкіх курсах. Увага да кнігі з боку следства была абгрунтаванай, калі ўзяць пад увагу факт, што Беларускі школьны аддзел дазволіў выкарыстоўваць яе ў школах без згоды Міністэрства асветы, а ў школьнай праграме адсутнічалі такія прадметы, як "Геаграфія Беларусі" і "Гісторыя Беларусі"[946].

---

[943] LVVA, 1612 f., 14 apr., 11 l., 5 lp.

[944] У лісце чытаем: "*Цяпер па чарзе – скліканне Агульнабеларускай Канферэнцыі за кардонам. У прынцыпе, гэта вырашана, – але ўсё залежыць ад матэрыяльнага забеспячэння, якога яшчэ няма і ці будзе – таксама яшчэ няведама. Аднак падгатоўчыя крокі я раблю, – бо адказныя людзі з літоўскага боку абяцалі чым-мага дапамагчы. Адкажэце, – як Вы ўглядаецеся на пытанне Канферэнцыі і ці зможа хто-небудзь паехаць на яе ад латвійскае беларускае калоніі. Для ўсяе справы гэта пытанне вельмі паважнае. Я ласьне, думаю, што голас латвійскіх беларусаў, калі яны будуць прадстаўлены, можа мець важнае значэнне ва ўсіх справах, якія будуць выдзвінуты на парадак дзённы. Прыкладам, справа Цэнтральнай Нацыян. Рады, ці Камітэту за кардонам, справа паразумення нанова з Літвой і г.д.*". LVVA, 3235 f., 2 apr., 3437 l., 17 lp.

[945] LVVA, 3235 f., 2 apr., 3437 l., 16 lp.

[946] *Беларускі працэс у Латвіі*, "Голас беларуса" 1925, № 5 ад 17 ліпеня, с. 2–3; К. Казачёнок, *"Белорусский процесс" в Латвии: обвинение, оправдание, наказание*, "Латыши и беларусы: вместе сквозь века. Сборник научных статей", ред. М.Г.Королёв, Минск 2012, с. 32.

Нягледзячы на тое, што падручнік А. Смоліча выкарыстоўваўся ў школах як неабавязковы, следчыя дасканала ацэньвалі яго змест. Напрыклад, звярталі ўвагу на сцвярджэнне аўтара, што ў выніку І сусветнай вайны межы новых дзяржаў парэзалі жывое цела Беларусі. Насцярогу выклікаў, таксама, наступны ўрывак: "*Кожны ведае, што для нас, беларусаў, Бацькаўшчына ёсць беларуская зямля, на якой мы самі жывём, дзе жывець беларускі народ, да якога мы належым. Геаграфія Бацькаўшчыны ёсць геаграфія Беларусі*"[947]. Больш за тое, падручнік утрымліваў мапу Беларусі, з якой вынікала, што частка беларускіх зямель знаходзіцца ў складзе латвійскай дзяржавы. На замову следства праф. Карліс Балодзіс (*Kārlis Balodis*) падрыхтаваў судовую экспертызу падручніка. Навуковец лічыў, што аўтар кнігі, кіруючыся беларускім нацыяналізмам, фальсіфікуе гісторыю з'яўлення беларусаў на беларуска-літоўскім і беларуска-латышскім памежжы. На думку прафесара, непераканаўча гучалі высновы А. Смоліча пра адвечную прыналежнасць гэтых зямель да Полацкага княства. Аўтар экспертызы падзяляў думку, што беларускамоўныя каталікі гэта не нашчадкі акаталічаных у перыяд польскага панавання праваслаўных беларусаў, а вынік славянізацыі мясцовых латышоў-латгальцаў. Навуковец выказаў сумнеў наконт існавання каталікоў-беларусаў і беларускай мовы ў Латгаліі і на Ілукшчыне. Разам з тым, ён прызнаваў, што частка жыхароў Латгаліі сапраўды размаўляе на той мове, пра якую пісаў А. Смоліч. У заключэнні чытаем: "*Пры цяперашнім стане рэчаў не ведаем, ці культывуем мы ў Латагліі і Ілукшце штучна нейкую беларускую мову, якой дасюль там ніколі не было. Навуковая вартасць падручніка Смоліча з кропкі гледжання геаграфіі – нізкая, гэта зборнік-кампіляцыя састарэлых 'падручнікаў'*" [948]. У выніку аўтар прыйшоў да высновы, што ў латвійскай школе падручнік не павінен выкарыстоўвацца[949]. Акрамя падручніка А. Смоліча следчыя ўважліва аналізавалі змест іншай беларускай літаратуры, знойдзенай у беларускіх школах. Сярод іх знаходзіліся працы Усевалада Ігнатоўскага, Аляксандра Цвікевіча, Канстанцыі Буйло, Яўхіма Карскага[950]. Апошняя апынулася ў полі зроку следства, бо ўтрымлівала этнаграфічную мапу з даданым тлумачэннем, што "*Латвія атрымала пагранічныя землі ў паветах Дзвінскім, Ілукштанскім, Дрысенскім, Люцынскім і Себежскім, усяго каля 6 тыс. кв. вёрст з 150 тыс. беларускага насельніцтва*"[951].

Некаторых беларускіх дзеячаў абвінавачвалі ў спробах займацца палітыкай у межах школы. Напрыклад, настаўнік М. Іваноў абвінавачваўся (на падставе арт.

---

[947] *Беларускі працэс у Латвіі*, "Голас беларуса" 1925, № 2 ад 20 чэрвеня, с. 3.

[948] Цыт. за: LVVA, 2125 f., 5 ap., 251 l., lp. 49; LVVA, 2125 f., 5 apr., 418 l., 9–11 lpp.

[949] LVVA, 2125 f., 5 ap., 251 l., lp. 49; LVVA, 2125 f., 5 apr., 418 l., 9–11 lpp.

[950] LVVA, 1612 f., 14 apr., 13 l., 207 lpp.

[951] Цыт. за: А. Вабішчэвіч, *"Але ж шлях да свабоды старонка праложа!"* [у:] *Сыны і пасынкі Беларусі*, рэд. С. Барыс, Менск 1996, с. 329.

130 КК) у антыдзяржаўнай прапагандзе, якая, нібыта, праяўлялася ў тым, што на занятках спеваў ён прымушаў вучняў спяваць "антыдзяржаўныя песні рэвалюцыйнага характару". У якасці прыкладу падаваўся гімн "Ад веку мы спалі". У выніку настаўнік быў вымушаны змяніць або прыбраць некаторыя ўрыўкі ("*мы дружна паўстанем з касамі, сярпамі*"), якія выклікалі незадаволенасць улад[952]. Тым часам настаўнікам А. Махноўскаму, Э. Вайводзішу і А. Сушынскай ставілася ў віну, што яны прапагандавалі сярод вучняў ідэю, згодна з якой Латгалія гэта "*нашая Бацькаўшчына нашая матка Беларусь, што Пустынская воласць і Дзвінск будуць уключаны ў Беларусь*"[953]. Падобная дзейнасць прыпісвалася настаўніцы Талаеўскай беларускай школы Прыдруйскай воласці Л. Габран. Пракурор сцвярджаў, што ў 1924 г. яна выкладала геаграфію па падручніку А. Смоліча выкарыстоўваючы пры гэтым мапу Беларусі і тлумачачы вучням, што "*Прыдруйская воласць належыць Беларусі, – што тутака хутка будзе Беларусь, якая сюды прыйдзе з вайной, і што Дзвінскі і Люцынскі паветы будуць належаць Беларусі*"[954]. Падобныя абвінавачанні фармаваліся ў адрас А. Якубецкага, які нібыта падчас заняткаў распавядаў вучням, што Латвія адабрала ў Беларусі частку яе тэрыторыі, выкладаў геаграфію па падручніку А. Смоліча і распавядаў вучням, што сапраўдная беларуска-латвійская мяжа павінна знаходзіцца значна на поўнач[955]. У дачыненні да настаўніка М. Талеркі выстаўлялася абвінавачанне, што ён на занятках геаграфіі карыстаўся вышэйзгаданай мапай Беларусі і тлумачыў вучням, што *"хутка тутака будзе Беларусь, і што Латвія дабрахоць аддасць тэрыторыю, належачую Беларусі*"[956].

Паводле абвінаваўцаў, вынікам працы настаўнікаў Э.Вайводзіша і М.Талеркі было пашырэнне чутак, што "*тыя Латвійскія правінцыі, якія населены беларусамі, будуць зноў аб'яднаныя ў адну беларускую дзяржаву тады, калі створыцца самастойная Беларусь*"[957]. Пракурор сцвярджаў, што мэтай гэтай дзейнасці была ідэйная апрацоўка мясцовага насельніцтва, каб з яго дапамогай у зручны момант далучыць Латгалію і частку Ілукшчыны да беларускай дзяржавы. Абвінаваўцы лічылі, што І. Краскоўскі нясе адказнасць за радыкалізацыю моладзі гімназіі, якой ён кіраваў. Непакой следчых выклікалі знойдзеныя ў кватэры І. Краскоўскага два малюнкі вучняў гімназіі "Беларускія ўзвышшы і раўніны" з мапай, на якой частка Ілукштанскага і Рэжыцкага

[952] К. Казачёнок, *"Белорусский процесс" в Латвии: обвинение, оправдание, наказание*, "Латыши и беларусы: вместе сквозь века. Сборник научных статей", ред. М.Г.Королёв, Минск 2012, с. 33.

[953] *Беларускі працэс у Латвіі*, "Голас беларуса" 1925, № 3 ад 1 ліпеня, с. 2.

[954] *Беларускі працэс у Латвіі*, "Голас беларуса" 1925, № 3 ад 1 ліпеня, с. 2.

[955] *Беларускі працэс у Латвіі*, "Голас беларуса" 1925, № 2 ад 20 чэрвеня, с. 3.

[956] *Беларускі працэс у Латвіі*, "Голас беларуса" 1925, № 3 ад 1 ліпеня, с. 2.

[957] *Беларускі працэс у Латвіі*, "Голас беларуса" 1925, № 1, с. 3.

паветаў знаходзіліся ў межах Беларусі. Следчыя з насцярогай ставіліся да кантактаў І. Краскоўскага з беларускімі сацыялістамі, якія пазітыўна выказваліся наконт БССР[958]. Акрамя таго, І. Краскоўскага вінавацілі ў тым, што на настаўніцкіх курсах у 1923 г. у сваіх лекцыях па гісторыі Беларусі ён неаднаразова падкрэсліваў жаданне стварэння самастойнай Беларусі і выказваў думку, што "*Беларусь ёсць там, дзе жывуць беларусы*"[959].

Тым часам на К. Езавітава прадстаўнікі абвінавачання ўскладалі віну за пашырэнне нацыяналістычных настрояў і літаратуры. Паводле следчых, у 1924 г., быўшы лектарам на беларускіх настаўніцкіх курсах, ён паказваў часопіс "На чужыне" і казаў, што беларускія землі знаходзяцца ў складзе Польшчы, Літвы і Латвіі, таму трэба імкнуцца да аб'яднання гэтых абшараў у адно дзяржаўнае ўтварэнне. Менавіта К. Езавітаву ставілася ў віну, што ён распаўсюдзіў па школах мапу, дзе Латгалія была пазначана як частка Беларусі. Беларускага дзеяча вінавацілі ў тым, што падчас яго кіравання ў Лудзенскай беларускай гімназіі туды трапіла палітыка, бо дырэктар прымушаў вучняў чытаць беларускія газеты. На думку абвінавачання, пры канцы 1922 г. К. Езавітаў у размове з кіраўніком беларускай школы ў вёсцы Зяленчыкі Прыдруйскай воласці Антонам Цімаховічам адзначыў, што будучая Беларусь ахопіць Лудзенскі, Рэжыцкі і Ілукштанскі паветы. У абвінаваўчым акце чытаем, што "*Геаграфію ён* [К. Езавітаў – ЕГ] *навучаў па падручніку Смоліча і пры гэтым тлумачыў, што Беларусь падзелена паміж многімі дзяржавамі і што Латвія адабрала ў Беларусі Дзвінск, Ілукштанскі, Люцынскі і Рэжыцкі паветы, якія павінны быць далучаны да складу Беларусі*"[960].

Некаторыя прадстаўнікі абвінавачання былі схільныя бачыць нацыяналістычную дзейнасць у беларускай школьнай справе. Беларускім дзеячам прыпісваліся махінацыі падчас стварэння школ, вінавацілі ў тым, што, прымаючы на працу настаўнікаў, кіраваліся нацыянальнымі, а не прафесійнымі матывамі. На думку абвінаваўцаў, ствараючы беларускія школы, іх арганізатары ўводзілі ў зман непісьменных сялян[961].

Засцярогі пракуратуры выклікала і дзейнасць таварыства "Бацькаўшчына", паколькі большасць беларускіх педагогаў належала да гэтай арганізацыі. Следчыя лічылі, што таварыства выходзіла далёка па-за межы сваёй статутнай

---

[958] T. Błaszczak, I. Matiash, D. Michaluk, *Iwan Kraskowski (1880–1955). W służbie Białorusi i Ukrainie*, Białystok 2019, s. 177–178.

[959] *Беларускі працэс у Латвіі*, "Голас беларуса" 1925, № 3 ад 1 ліпеня, с. 2; *Беларускі працэс у Латвіі*, "Голас беларуса" 1925, № 2 ад 20 чэрвеня, с. 3.

[960] *Беларускі працэс у Латвіі*, "Голас беларуса" 1925, № 2 ад 20 чэрвен, с. 3.

[961] К. Казачёнок, *"Белорусский процесс" в Латвии: обвинение, оправдание, наказание*, "Латыши и беларусы: вместе сквозь века. Сборник научных статей", ред. М.Г.Королёв, Минск 2012, с. 37.

дзейнасці (культурна-асветнай) і займалася палітыкай[962]. Адзначалася, што да з'яўлення ў Латвіі І. Краскоўскага таварыства "Бацькаўшчына" займалася выключна асветнымі справамі, але пасля прыезду гэтага дзеяча арганізацыя пачала таемную агітацыю на карысць стварэння самастойнай Беларусі. Звяртае на сябе ўвагу факт, што падчас допытаў некаторыя сябры таварыства сведчылі, што былі запісаныя ў арганізацыю насуперак уласнай волі. Пракуратуру цікавіла паходжанне "Бацькаўшчыны" і яе сувязь з аднайменным таварыствам, якое дзейнічала ў Менску і Горадні ў 1918–1919 гг.[963] У абвінаваўчым акце адзначалася, што беларускія дзеячы стварылі таварыства "Бацькаўшчына", якое, хоць і мела зацверджаны латвійскім судом статут, карысталася статутам менскага таварыства "Бацькаўшчына" (1918 г.)[964].

Антыдзяржаўную сепаратысцкую дзейнасць падсудных следчыя звязвалі з тым, што яны трымалі шчыльныя кантакты з палітычнымі сіламі па-за межамі Латвіі. Непакой следчых выклікалі кантакты беларускіх дзеячаў Латгаліі з прадстаўнікамі як БССР, так і беларускай незалежніцкай эміграцыі. Латвійскі бок непакоіў факт, што лідары латгальскіх беларусаў працягвалі заставацца дзейнымі актывістамі беларускага незалежніцкага руху, пра што сведчылі іх кантакты з аднадумцамі за мяжой. У агентурных зводках звярталася ўвагу на тое, што І. Краскоўскі трымаў сувязь з беларускімі дзеячамі ў Празе і Маскве. Следчым было вядома пра кантакты К. Езавітава з беларускім актывам у Чыкага, Таліне, Празе і Коўне[965].

У якасці доказаў віны разглядаліся рэчы, знойдзеныя ў падсудных падчас ператрусаў. У прыватнасці, у кватэры К. Езавітава паліцыя знайшла: 1) этнаграфічную мапу Беларусі; 2) рускамоўны артыкул *Змагайся – пераможаш*, бюлетэнь выдадзены замежным сектарам БПС-Р з заклікам да беларусаў ахвяраваць на фонд беларускага вызвалення; 3) ліст да К. Езавітава (19 снежня 1923 г.) з Менску ў справе ўзбуйнення БССР; 4) падручнік А. Смоліча *Геаграфія Беларусі*, 5) ліставанне К. Езавітава з пражскімі беларусамі, у тым ліку – з Тамашом Грыбам, у лісце да якога лідар латвійскіх беларусаў прапаноўваў склікаць беларускі нацыянальны кангрэс з мэтай вырашэння спрэчных пытанняў паміж правадырамі беларускага руху. Тым часам, падчас ператрусу ў кватэры У. Корці былі знойдзены: 1) брашура А. Цвікевіча *Беларусь*, у якой сцвярджалася, што беларуская дзяржава павінна быць

---

[962] LVVA, 1612 f., 14 apr., 10 l., 227–228 lpp.

[963] К. Казачёнок, *"Белорусский процесс" в Латвии: обвинение, оправдание, наказание*, "Латыши и беларусы: вместе сквозь века. Сборник научных статей", ред. М.Г.Королёв, Минск 2012, с. 36.

[964] *Беларускі працэс у Латвіі*, "Голас беларуса" 1925, № 18 ад 20 лістапада, с. 3.

[965] LVVA, 1612 f., 14 apr., 10 l., 230 lp.

створана ў этнаграфічных межах; 2) асобнікі газеты "Беларускі Сцяг" (№ 1, 1922) з артыкулам, у якім гаварылася, што "барацьба за вызваленне Беларусі ёсць барацьбой за яе самастойнасць"; 3) запрашэнне (10 жніўня 1921 г.) кіраўніцтву таварыства "Бацькаўшчына" ад пражскіх беларусаў да ўдзелу ў арганізацыі беларускай нацыянальнай канферэнцыі; 4) рэферат Т. Грыба прачытаны ім 15–16 студзеня 1921 г., у якім адзначалася, што Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў павінна несці штандар вольнасці і непадзельнасці Беларусі; 5) пасланне Беларускага нацыянальнага хаўрусу (15 сакавіка 1923 г.) кіраўніцтву таварыства "Бацькаўшчына" з віншаваннем са святам абвяшчэння БНР – тэкст сканчаўся словамі: "Хай жыве незалежная і непадзельная Беларусь!". У сваю чаргу, у настаўніка С. Казекі былі знойдзены: 1) статут таварыства "Бацькаўшчына" (Менск, 1918 г.), у якім адзначалася, што таварыства пашырае сваю дзейнасць не толькі на беларускія землі, але і на калоніі беларусаў; 2) часопіс "На чужыне" з мапай беларускай дзяржавы, у межах якой знаходзілася частка Латгаліі. Прадметам увагі стаў ліст А. Цвікевіча да І. Краскоўскага, у якім прэм'ер БНР пісаў пра патрэбу стварэння адзінага беларускага вызвольнага руху "ад Вільні і Прагі па Дзвінск і Менск". Следчых зацікавіў таксама ліст аднаго з ковенскіх беларусаў да І. Краскоўскага і У. Пігулеўскага, у якім адзначалася: "*Усход прасіць трымацца колькі толькі магчыма, і далучыць усходнія землі да іх хутара (...) Цэнтр цяпер знаходзіцца ў Літве. Калі б толькі яго не папрасілі выехаць. Гэта яго справа, але дзе-б ён ні быў, ён застанецца незалежным ні ад каго. Навокал асяродка трэба нам аб'яднаць усё, што ў нас ёсць і адным фронтам дабіцца незалежнага існавання і на бацькаўшчыне*"[966].

Следства і судовы працэс стаў для беларускага актыву Латвіі своеасаблівым іспытам на трываласць і салідарнасць. Падзеі выклікалі неспакой сярод латвійскіх беларусаў, якія па-рознаму паводзілі сябе ў чаканні фіналу. Вось якім чынам стан беларускіх дзеячаў апісаў У. Пігулеўскі ў лісце (верасень 1924 г.) жонцы В. Ластоўскага, Станіславе: "*У Дзвіншчыне [справы] ідуць добра, у Люцыншчыне так сабе. Тут такія вожыкі сабраліся сярод латышоў, што ні з якага боку пакуль яшчэ я да іх не падышоў (...) У Рызе справа ідзе асобнай чарадою, там і жывуць, і навучаюць дзяцей у пачатковай школе, а курсантаў на вучыц.[ельскіх] курсах зусім асобна (...) Следства над намі цягнецца. Я кожны тыдзень пасылаю, чы прывожу ў Рыгу розныя даклады і мемарандумы членам Сойму. Езавітаў сядзіць і працуе над беларускай мовай. Варункі для яго ніштo. Асобны пакой, добрае (запраўды) адношанне адміністрацыі. З разы ў тыдзень перадаюць яму ежу з волі. Піша, што патаўсцеў здорава. Паўлінка зусім высахла. Краскоўскі пасівеў. Якубецкага з-пад жончынага*

[966] *Беларускі працэс у Латвіі*, "Голас беларуса" 1925, № 3 ад 1 ліпеня, с. 2; *Беларускі працэс у Латвіі*, "Голас беларуса" 1925, № 4, с. 2–3.

абцасу не відаць"[967]. У іншым лісце (27 снежня 1924 г.) беларускі дзеяч пісаў: "*як бачыце, настрой яшчэ моцны і прыходзіцца ім карыстацца для таго, каб накручваць Паўлінку і Краск.[оўскага], бо яны, папраўдзе кажучы, здорава прыбітыя. Якубецкі – той безнадзейны. Арыентацыя на двухспальны ложак з фіранкамі і ружовымі бантамі за год так умацавалася, што замест дзеяча засталась толькі пара*"[968]. У іншых фарбах сітуацыю прадстаўляла П. Мядзёлка-Грыб, якая 2 лютага 1925 г. пісала В. Ластоўскаму: "*Душа так змучана перажываннямі апошніх часоў, што адна думка аб школе, якую мы стварылі і паднялі на належную вышыню і якая цяпер руйнуецца подлымі рукамі, – можа звясці з розуму. Хочацца аб усім забыцца, хоць на якісь час адпачыць. Шчыра зайздрошчу цяпер Кастусю – ён не бачыць, не чуе ўсёй той подласці і ўсяго жаху, сярод якога мы цяпер жывём. Трудна ўсё перадаць у пісьме*"[969].

Пакуль следчыя дапытвалі сведак і збіралі доказы віны, беларускі актыў рыхтаваўся да абароны. Асноўны яе цяжар у інфармацыйнай прасторы ляжаў на Беларускім школьным аддзеле, кіраўнік якога лічыў, што падазронасць латышскіх улад да беларусаў узмацняла з аднаго боку прапаганда нядобразычліўцаў, а з другога – адсутнасць у латвійскім грамадстве ведаў пра беларускае жыццё, паколькі латвійскія беларусы не праяўлялі палітычнай актыўнасці, засяродзіўшыся на культурна-асветнай працы[970]. У разгар следства (20 верасня 1924 г.) С. Сахараў даў інтэрв'ю рускамоўнай газеце "Сегодня", падчас якога выказаў надзею, што распачатая ў Латвіі беларуская школьная справа, нягледзячы на ўсе перашкоды, будзе ісці наперад[971].

Вострым пытаннем стаяў пошук сродкаў на медыйную кампанію і судовыя разбіральніцтвы, у тым ліку – на аплату зарукі і паслуг адвакатаў. Латвійскія беларусы шукалі падтрымкі як у Латвіі, так і па-за яе межамі. У верасні 1924 г. У. Пігулеўскі падрыхтаваў зварот беларускіх дзеячаў Латвіі да беларускай грамадскасці, у якім прасіў дапамагчы абараніцца ад абвінавачанняў[972]. 2 студзеня 1925 г. П. Мядзёлка-Грыб накіравала ліст В. Ластоўскаму, у якім звяртала ўвагу на вялікія кошты за паслугі абаронцаў. З ліста вядома, што беларусы нанялі чатырох адвакатаў з Рыгі. Агулам выдаткі на абаронцаў складалі каля 300 тыс. рублёў, з якіх 50 тыс. рублёў склаў ганарар абаронцы К. Езавітава. Дзяячка адзначала, што не баіцца турмы, але ведае, што параза беларусаў у судзе будзе азначаць паразу ўсёй беларускай працы ў Латвіі. У сувязі з гэтым яна прасіла В. Ластоўскага дапамагчы грашыма: "*Сяляне*

---

[967] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 56, л. 155–155 зв.

[968] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 56, л. 156.

[969] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1563.

[970] LVVA, 2125 f., 5 apr., 106 l., 7 lp.

[971] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 167, л. 10.

[972] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1548.

ўжо напалоханы, а як нас не апраўдаюць – то зусім перастануць пасылаць дзяцей у беларускія школы. І дзеля гэтага трэба ратаваць не нас, як такавых, а справу (...) Пане Вацлаве! Памазгуйце крыху – дапамажэце нам абараніць нашу справу ад нягоднай напасці, якая фарбыкуецца ў Варшаве. Чакаем Вашай дапамогі"[973].

Па дапамогу да былога прэм'ера БНР звярнуліся таксама У. Пігулеўскі і К. Езавітаў. Першы інфармаваў В. Ластоўскага пра становішча латвійскіх беларусаў у сувязі са следствам[974]. Аналіз зместу яго лістоў паказвае, што нават у сітуацыі крызісу мясцовыя беларускія дзеячы не здолелі ўстрымацца ад унутраных спрэчак. У адным з лістоў (3 ліпеня 1924 г.) У. Пігулеўскі выказаў меркаванне, што віну за працэс часткова нясе К. Езавітаў, які атачыў сябе неадпаведнымі людзьмі, якія рабілі даносы ў паліцыю на беларускіх дзеячаў. Аўтар ліста лічыў, што гэтыя людзі "*творили волю пославших их*" даючы зразумець, што за імі стаялі варожыя небеларускія сілы[975]. 13 лютага 1925 г. У. Пігулеўскі звярнуўся да В. Ластоўскага з просьбай даслаць грошы на адваката К. Езавітава[976], на што былы беларускі прэм'ер адрэагаваў пазыкай у памеры 50 далараў[977].

---

[973] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1564.

[974] Упершыню У. Пігулеўскі напісаў ліст В. Ластоўскаму 3 ліпеня 1924 г., у якім адзначаў: "*Да таго часу не лічыў магчымым пісаць Вам, таму што ведаў наш погляд на тактычную нашую барацьбу ў Латвіі, а разам з тым і Вашае адношанне да кваліфікаванага, патэнтаванага дзеяча як К.Е., а з другога боку да такога маленечкага чалавека як я. Адзін – абсалютная безабмылковасць, другі – абсалютная абмылковасць*". БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 256, л. 39.

[975] Аўтар прыводзіў прыклад былой настаўніцы беларускай школы, полькі Ванды Паланевіч і сябра ўправы таварыства "Бацькаўшчына" Уладзіміра Корці. Пра першую ён пісаў, што яна "*хворая (на вядомую хваробу) і таму зусім ненармальная кабета гадоў 45-ці, простая, абсалютна нэінтэлігентная, былая вучыцелька белар.[арускай] школы, полька, закаханая у К.[анстанціна] Е.[завітава], падтрымліваная ім (сябра яго як старшыні на леташнім кангрэсе вучыц.[целяў]) і таму зразумела ненавідзячая ўсіх нас (...) Даносы яе ў паліт. ахранку і смешныя, і брыдкія*". Тым часам, У. Корці характарызаваўся як "*вучыцель Дзвінскай Бел.[арускай] Гімназіі – малады чалавек, манархічных поглядаў, якога я з прошлага году разглядаў як звычайнага правакатара, але ўсе мае патрэбаванні зволіць яго разбівалісь аб І. Краскоўскага, які па недальнавіднасці яго бараніў. Корці ўжо ў прошлым годзе думаў здзейсніць звычайны правакатарскі прыём – стварэнне патайнай арганізацыі, але, выведзены мной і Якубецкім на чыстую ваду ў прысутнасці Сахарава і Краск.[оўскага], павінен быў ад гэтых вядомых усіх прыёмаў адмовіцца. А цяпер, калі прымусіў час, яму засталось толькі адно 'абгавор'*". БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 56, л. 40–40 зв. Паводле аўтара ліста, былая настаўніца раней была звольненая з працы за тое, што абменьвала ў вучняў яйкі на папяросы і тытунь (К. Казачёнок, *"Белорусский процесс" в Латвии: обвинение, оправдание, наказание*, "Латыши и беларусы: вместе сквозь века. Сборник научных статей", ред. М.Г.Королёв, Минск 2012, с. 35).

[976] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1571.

[977] Сведчыць пра гэта ліст В. Ластоўскага да Езавітава ў 1925 г.: "*Думаю, вялікі час звярнуць мне 50 далараў каторыя я праз рукі грам. Сахарава пазычыў Вам на працэс, а таксама грошы*

Тым часам К. Езавітаў з-за турэмных кратаў выслаў В. Ластоўскаму і яго жонцы некалькі лістоў[978]. Лідар латвійскіх беларусаў прасіў былога прэм'ера падтрымаць не столькі грашыма, колькі матэрыяламі, якія маглі б дапамагчы яму давесці сваю нявіннасць у судзе. У лісце Станіславе Ластоўскай (15 жніўня 1924 г.) ён пісаў: "*Былъ бы весьма благодаренъ Вацлаву Юстыновичу и Вамъ, если бы вы вообще прислали б›лорусскихъ книжекъ сколько можно*"[979]. У прыватнасці, ён прасіў даслаць кнігі М. Доўнар-Запольскага, А. Цвікевіча і Я. Варонкі, і газету "Белорусская Земля", № 1, за 1918 год з тэкстам устаноўчай граматы БНР[980]. Рыхтуючыся да судовага разгляду, К. Езавітаў склаў спіс з 50 патэнцыйных асоб, якія маглі б выступіць у яго абарону. Сярод іх можна пералічыць: дэпутата Сойма Яніса Райніса, сябра Даўгаўпілскай гарадской управы Себасцяна Пабержа, інспектара асноўных школ Ілукштанскага павета Яніса Пабержа, кіраўніка БША С. Сахарава, настаўнікаў Я. Шчорса, Вольгу Васільеву і Раісу Жданко, святароў кс. Антона Альшэўскага і кс. Язэпа Гайлевіча, актывістаў таварыства "Бацькаўшчына" Марыю Харлап, Мікалая Талерку, Алеся Махноўскага, вучняў Валянціну Казлоўскую, Яна Доўгага, Дамініка Мяжэцкага і шэраг іншых асоб з ліку настаўнікаў, вучняў

за слоўнікі, за каторыя заплаціў выдавецтву гатоўкай. Вы ў значна лепшым знаходзіцеся палажэнні ад мяне і дзеля гэтага не можаце вымагаць, каб я паносіў кару за сваю ў свой час зычлівасць да Вас". LCVA, f. 368, ap. 1, b. 31, l. 7.

[978] Варта прывесці ўрывак ліста, датаванага 1 ліпеня 1924 г. Звяртаючыся ў ім да В. Ластоўскага, ён пісаў: "*не удивляйтесь, что пишу по-русски: 'независящія обстоятельства'! Поздравляю Вас съ новымъ матеріаломъ въ Вашей работ: въ 'Исторіи белорусскаго Національнаго Возрожденія' къ главе 'О белорусскомъ Національномъ Меншинстве в Латвіи' прибавилась новая страница-эпизодъ –'Белоруссы в Латвійской тюрьме'. И такъ остается еще только одно звено незаполненнымъ, – только украинская тюрьма не вид›ла еще белорусских общественныхъ работниковъ. А так уже полный кругъ: великоруссы, поляки, немцы, литовцы и латыши (...) Обвиняютъ меня по 102-й статье, въ стремлении отторгнуть части Латвіи (по сей статье положено – 8–10 летъ каторги). Дело основано на сплетняхъ нашихъ общихъ съ латышами враговъ, но так какъ у Латвійской Фемиды, как и у всехъ фемидъ міра, глаза завязаны, то идетъ нескончаемое 'следствіе'. Сижу уже второй месяцъ. От скуки много читаю, но библіотека зд›сь ничтожнейшая, а потому больше пишу. Даже мозоли отъ карандаша появились. Послалъ бы Вамъ уже кое-что, но материалы должны пройти через такую канитель, что даже обидно за рукопись становицца, а потому решилъ ждать 'воли', какъ говорятъ въ тюрьме. Сижу не безъ комфорта, – имею комнату сь отдельнымъ входомъ, никто не безпокоитъ меня обременительными разговорами и лишними визитами*". БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 256, л. 36.

[979] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 256, л. 148–149.

[980] У адным з лістоў К. Езавітава С. Ластоўскай чытаем: "*Весьма прошу извинить за навязываемыя Вамъ хлопоты и покорно прошу не отказать въ исполненіи моихъ просьбъ, особенно же объ Уставныхъ Грамотахъ, ибо въ нихъ есть упоминаніе и о границахъ Белоруссіи, а это весьма важно для моего дела, ибо должно доказать справедливость некоторых моихъ показаній*". БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 256, л. 148–149.

і прыхільнікаў беларускай адукацыі. Разам беларускі дзеяч пералічыў 40 сведкаў, якія яго ведалі і супрацоўнічалі з ім у розны час[981].

Судовае пасяджэнне ў Латгальскім акруговым судзе пад кіраўніцтвам яго старшыні, суддзі Фрыціса Зілберса (*Fricis Zilbers*) адбылося ў Даўгаўпілсе 2–4 красавіка 1925 г. У працэсе ўзялі ўдзел таксама суддзі – О. Кеснерс (*O. Kesners*), А. Камбергс (*A. Kambergs*), В. Грэйерс (*V. Greiers*). Абвінаваўчы бок прадстаўляў пракурор Аўгустс Лукіньш, а беларускіх дзеячаў абараняў шэраг адвакатаў: К. Езавітава і М. Іванова – прысяжны адвакат Рыгі Віліс Холцманіс (*Vilis Holcmanis*), У. Пігулеўскага і І. Краскоўскага – прысяжны адвакат Рыгі Юлій Шмітс (*Jūlijs Šmits*), А. Якубецкага – той жа Юлій Шмітс і прыватны адвакат Яніс Будоўскіс (*Jānis Budovskis*), П. Мядзёлку-Грыб – таксама Яніс Будоўскіс, П. Жэрдзі – прыватны адвакат Брэжга, У. Корці – прыватны адвакат Рупаіс[982]. Суд пачаўся з выступу пракурора, які паставіў пад сумнеў лаяльнасць беларускіх дзеячаў у дачыненні да латвійскай дзяржавы. Ён падкрэсліў, што частка з іх (С. Сахараў, Я. Шчорс) раней была на расійскай службе, а іншыя (І. Краскоўскі, А. Якубецкі, П. Мядзёлка-Грыб) з'яўляліся іншаземцамі і падтрымлівалі адносіны з замежнымі краінамі. Ён характарызаваў беларускі актыў як замежных агентаў альбо людзей, якія не жадалі інтэгравацца ў латвійскае грамадства. Ніводзін з абвінавачаных беларускіх дзеячаў не прызнаў віны. Кожны даводзіў сваю нявіннасць. Напрыклад, у адказ на абвінавачванні ў захоўванні друкаваных матэрыялаў антыдзяржаўнага зместу К. Езавітаў адзначыў, што знойдзеную ў яго кватэры паштоўку БНР з выявай мапы Беларусі ён атрымаў з кнігарні Міністэрства беларускіх спраў Літвы і перадаў у камісійную краму ў Даўгаўпілсе, каб зарабіць грошай. Адначасова ён тлумачыў, што выданне "На чужыне" ён пакінуў сабе на памяць, бо сам некалі яго выдаваў. Беларускі дзеяч не бачыў нічога кепскага ў тым, што некалькі асобнікаў гэтага часопіса ён падараваў настаўнікам. Акрамя таго, К. Езавітаў адзначаў, што таварыства "Бацькаўшчына" не ставіла палітычных мэтаў, а культурна-асветныя. А што да межаў будучай Беларусі, дык яны павінны ахопліваць землі, у большасці населеныя беларусамі, але Латгалію ён не лічыць такой, паколькі яна з'яўляецца шматнацыянальным абшарам. Лідар латвійскіх беларусаў не адмаўляў, што перапісваецца з былымі і дзейнымі сябрамі БПС-Ф, да якой ён некалькі належаў як дзеяч БНР[983].

Тлумачачы захоўванне беларускіх матэрыялаў, К. Езавітаў звяртаў увагу на тое, што яны не маюць антыдзяржаўнага зместу. Ён падкрэсліваў, што

---

[981] LVVA, 1612 f., 14 apr., 11 l., 76–82 lpp.

[982] М. Друговейко, *"Преступный союз белорусов" в Латгалии (1924–1925 год) в документах Латвийского государственного исторического архива Национального архива Латвии*, "Przegląd Środkowo-Wschodni" 2025, nr 10, s. 199 (у друку).

[983] *Беларускі працэс у Латвіі*, "Голас беларуса" 1925, № 5 ад 17 ліпеня, с. 2–3.

надрукаваны ў выданні “На чужыне” заклік да ўзброенага змагання належыць разумець як выступленне балахоўцаў супраць сіл, якія тады захапілі Беларусь, а мапа, надрукаваная на старонках выдання, пазначала беларускі этнаграфічны абшар паводле нямецкіх, расійскіх, польскіх і беларускіх крыніц[984]. Лідар латвійскіх беларусаў не аспрэчваў таго, што ён часамі чытаў вучням беларускія газеты, але рабіў гэта ў межах пазакласнага чытання, што адпавядала школьнай праграме[985]. Сведка працэсу Людміла Краскоўская адзначала добрую працу па абароне К. Езавітава адваката В. Холцманіса[986].

Тым часам, У. Пігулеўскі заявіў, што БПС-Ф ніколі не аспрэчвала дзяржаўных межаў Латвіі. Дырэктар гімназіі І. Краскоўскі падкрэсліў, што ён не чуў, каб таварыства “Бацькаўшчына” служыла палітычным мэтам. Адначасова ён пацвердзіў, што меў зносіны з беларускімі дзеячамі за мяжой, але, на яго думку, яны не тычыліся палітычных спраў, а мелі выключна нацыянальна-культурны характар. У сувязі з гэтым ён сцвярджаў, што выкарыстаны А. Цвікевічам у лісце да яго выраз аб стварэнні адзінага нацыянальнага фронту “ад Вільні і Прагі па Дзвінск і Менск” належыць разумець як нацыянальна-культурную заяву, а не палітычную. Па аналогіі з гэтым іншы выраз – “беларускі вызваленчы рух” – І. Краскоўскі разумеў як культурнае адраджэнне беларускага народа. Ужыванне ў падначаленай яму гімназіі падручніка А. Смоліча дырэктар тлумачыў тым, што ён не ведаў пра забарону на яго выкарыстанне з боку латвійскіх улад[987].

Іншы падсудны А. Якубецкі пераконваў следства, што ніводзін кавалак латвійскай дзяржавы не павінен быць далучаны да Беларусі. Беларускі дзеяч акцэнтаваў увагу на тым, што знойдзеныя ў яго кватэры малюнкі вучняў з выявай мапы Беларусі з’яўляюцца класнымі працамі, на якіх адлюстраваныя межы рассялення беларусаў, а не дзяржаўныя межы краіны. Думкі калег наконт непарушнасці тэрытарыяльнай цэласнасці Латвіі падзяляла П. Мядзёлка-Грыб. У судзе яна адзначыла, што была ў партыі беларускіх эсэраў задоўга да прыезду ў Латвію[988]. Настаўнік М. Іваноў запэўніваў суд, што, спяваючы з вучнямі беларускія песні *Не пагаснуць зоркі ў небе* і *Ад*

---

[984] *Беларускі Процэс у Латвіі*, Рыга 1926, с. 27; *Беларускі працэс у Латвіі*, “Голас беларуса”, 1925, № 9 ад 18 жніўня, с. 3.

[985] *Беларускі працэс у Латвіі*, “Голас беларуса” 1925, № 13 ад 19 верасня, с. 2.

[986] У лісце Л. Краскоўская занатавала: “*Речь защитника Езовитова Гольцмана была насколько блестяща и серьёзна, что после неё у Езовитова не осталось обвиниения и в своей второй речи прокурор набросился исключительно на папу*”. Д. Крэнт, *Матэрыялы Цэнтра даследаванняў старадрукаваных кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі як крыніца па гісторыі беларускага нацыянальна-культурнага жыцця ў Латвіі ў 1920–1930-ыя гг.*, “Латыши и беларусы: вместе сквозь века” 2023, № 13, с. 120.

[987] *Беларусі працэс у Латвіі*, “Голас беларуса” 1925, № 7 ад 31 ліпеня, с. 2–3.

[988] *Беларусі працэс у Латвіі*, “Голас беларуса” 1925, № 7 ад 31 ліпеня, с. 3.

веку мы спалі, ён не здзейсніў злачынства, паколькі ў апошнім утворы ў першым куплеце замяніў словы "трэба зладзеяў забіць" на "трэба прасвету здабыць". Такім чынам, песня не магла выклікаць у вучняў ніякіх палітычных канатацый [989].

На фоне іншых вылучаўся У. Корці, які, з аднаго боку, запярэчыў таму, што ён ці знаёмыя яму настаўнікі навучалі вучняў, што Латвія захапіла частку беларускай зямлі і што Даўгаўпілс з'яўляецца беларускім горадам, але з іншага не выключаў, што, кажучы пра "непадзельную Беларусь", беларускія дзеячы маглі мець на ўвазе тое, што частка Латвіі павінна апынуцца ў складзе Беларусі. Акрамя таго, У. Корці звяртаў увагу на тое, што ён быў супраць палітызацыі дзейнасці таварыства "Бацькаўшчына" шляхам усталявання кантактаў з арганізацыямі па-за межамі Латвіі. У прыватнасці, ён заклікаў іншых сяброў управы не адказваць на вышэйзгаданы ліст А. Цвікевіча[990].

Суд браў пад увагу не толькі словы падсудных, але і меркаванні сведак. Разам суд пагадзіўся выслухаць 120 сведак, у тым ліку 74 з боку абвінавачання і 46 – абароны. У практыцы ў суд з'явіліся 67 сведак, якія сведчылі супраць падсудных і 42 – на іх карысць. У ліку апошніх былі беларускія настаўнікі, вучні беларускіх школ і іх бацькі, а таксама асобы, якія мелі датычнасць да беларускай культурна-асветнай працы[991]. Напрыклад, сведка С. Казека сцвердзіў, што карыстаўся падручнікам А. Смоліча і лічыць, што кожны настаўнік павінен з ім азнаёміцца, бо нічога дрэннага ён не бачыць у тым, каб педагогі ўдасканальвалі сваю працу. Пры гэтым сведка дадаў, што ніхто з вучняў падручніка не меў, бо ім карысталіся толькі настаўнікі. На думку С. Казекі, у мурах Лудзенскай беларускай гімназіі не вяліся палітычныя гутаркі, у тым ліку пра падзел Латвіі, а наадварот, дырэктар К. Езавітаў, неаднаразова прамаўляючы перад выхаванцамі школы, падкрэсліваў адвечныя сувязі беларусаў і латышоў, адзначаючы, што Латвія ніколі не прыгнятала беларусаў[992]. Падчас допытаў С. Казека пацвердзіў, што карыстаўся часопісам "На чужыне" і мапай Беларусі, але патлумачыў вучням, што на ёй паказаныя межы рассялення беларусаў, а не дзяржаўныя межы. З гэтай мэтай ён зрабіў на мапе пазначэнне "Карта беларусаў" і "Палітычны падзел беларусаў"[993]. Іншы сведка М. Хмялеўскі, які быў скарбнікам у першай управе таварыства "Бацькаўшчына", у судзе засведчыў, што не памятае, каб сябры арганізацыі абмяркоўвалі палітычныя пытанні. У працэсе ў якасці сведкі ўдзельнічаў М. Дзямідаў, які паводзіў сябе стрымана, адзначаючы,

---

[989] *Беларускі працэс у Латвіі*, "Голас беларуса" 1926, № 2 ад 25 сакавіка, с. 2–3.

[990] LVVA, 1612 f., 14 ap., 11 l., 89–94 lpp.

[991] *Беларускі працэс у Латвіі*, "Голас беларуса" 1925, № 8 ад 7 жніўня, с. 3.

[992] *Беларускі працэс у Латвіі*, "Голас беларуса" 1925, № 8 ад 18 жніўня, с. 2.

[993] LVVA, 1612 f., 14 ap., 11 l., 121–123, 127–129 lpp.

што яму нічога не вядома пра дзейнасць беларускіх палітычных партый і іх праграмы, пра якія ён чуў толькі з прэсы[994].

Са сведчанняў іншых настаўнікаў і вучняў вынікала, што ў школьных мурах і на настаўніцкіх курсах не вяліся размовы пра беларускую дзяржаўнасць і магчымасці далучэння да яе Латгаліі. Наадварот, настаўнікі з кожнай нагоды падкрэслівалі прыхільнае стаўленне Латвіі да беларусаў, якой процістаўлялася Польшча, а пра Беларусь гаворка ішла толькі як аб "этнаграфічнай краіне, а не як аб дзяржаве"[995]. Падчас судовага пасяджэння вучням была паказаная этнаграфічная мапа Беларусі, на якой яны павінны былі паказаць, дзе знаходзіцца межы гэтай краіны. Сярод сведак абароны знаходзіліся вядомыя ў Латвіі асобы – былы міністр унутраных спраў у 1919–1921 гг. Арведс Бергс (*Arveds Kārlis Kristaps Bergs*) і былы дыпламат Петэрыс Азоліньш (*Pēteris Oliņš*). Апошні адзначыў, што з беларускім нацыянальным рухам ён пазнаёміўся ў 1919 г. і ўжо тады ў яго склалася ўражанне, што гэты рух не стварае пагрозы для Латвіі і латышоў, а наадварот – з'яўляецца яго шчырым прыхільнікам і хаўруснікам[996].

Тым часам сведкі з боку абвінаваўцаў прадэманстравалі непаслядоўнасць у поглядах. Сведчанні некаторых з іх на судзе разыходзіліся з тым, што яны казалі следчаму падчас следства. Прыкладам з'яўляецца рускі настаўнік А. Храбтоў, які ў судзе адмовіўся ад ранейшых сведчанняў[997]. Свой учынак патлумачыў тым, што на судзе ён мусіў сведчыць пад прысягай. У выніку А. Храбтоў сказаў, што, нягледзячы на свае ранейшыя заявы, ён не знаёмы з К. Езавітавым і не ведае яго поглядаў, таму не можа сцвярджаць, што той заклікаў да далучэння Даўгаўпілса да Беларусі[998]. Іншы сведак абвінавачання, дырэктар Даўгаўпілскай рускай гімназіі Георгій Садоўскі не здолеў патлумачыць, чаму вырашыў выйсці з таварыства "Бацькаўшчына", сябрам якога быў на працягу некалькіх месяцаў[999]. Тым часам галоўныя сведкі з боку абвінавачання (рускія Э. Асанаў і А. Васільеў) дыскрэдытавалі сябе скандальнымі паводзінамі. Падчас следства высветлілася, што яны ў мінулым былі пакараныя за ашуканства, паколькі свядома выдавалі сябе за манархістаў, каб атрымаць на гэта грошы ад прыхільнікаў адраджэння дынастыі Раманавых. Яны не паходзілі з Латгаліі, таму следчыя не лічылі іх знаўцамі мясцовага беларускага руху ў Латвіі. Гэтыя людзі ўвялі ў зман следчых,

---

[994] *Беларускі працэс у Латвіі*, "Голас беларуса" 1925, № 8 ад 18 жніўня, с. 2.

[995] *Беларускі працэс у Латвіі*, "Голас беларуса" 1925, № 16 ад 30 кастрычніка, с. 2.

[996] *Беларускі працэс у Латвіі*, "Голас беларуса" 1925, № 8 ад 7 жніўня, с. 3.

[997] T. Błaszczak, I. Matiash, D. Michaluk, *Iwan Kraskowski (1880–1955). W służbie Białorusi i Ukrainie*, Białystok 2019, s. 179.

[998] *Беларускі працэс у Латвіі*, "Голас беларуса" 1925, № 8 ад 18 жніўня, с. 2.

[999] LVVA, 1612 f., 14 ap., 10 l., 227 lp.

падаючы хлуслівыя звесткі пра існаванне ў Латвіі “тайнай беларускай арганізацыі”, якая, нібыта, рыхтавала ўзброенае паўстанне, доказам чаго меў быў ліст К. Езавітава А. Якубецкаму з просьбай даслаць беларускі вайсковы статут. Больш за тое, гэтыя сведкі пераконвалі следчых, што статут “Бацькаўшчыны” (1919 г.) быў надрукаваны ў Менску за савецкія грошы. Дадзеную інфармацыю з лёгкасцю аспрэчыў К. Езавітаў, які патлумачыў, што ў сапраўднасці статут быў выдадзены ў Коўне за грошы літоўскага боку, а яго выкарыстанне дзеячамі “Бацькаўшчыны” не з’яўлялася нічым супрацьзаконным, паколькі як менская, так і латгальская арганізацыі з той самай назвай з’яўляліся таварыствамі культурна-асветнага характару[1000]. Таксама К. Езавітаў патлумачыў, што вайсковы статут ён і А. Якубецкі трымалі дзеля навучальных мэтаў, паколькі абодва выкладалі гімнастыку і мусілі ведаць беларускамоўныя каманды[1001].

Падсумоўваючы, можна адзначыць, што, нягледзячы на тое, што сведак абвінавачання было больш, у рэальнасці яны (з выключэннем паліцыянтаў і некалькіх настаўнікаў-рускіх) не змаглі даць паказанняў, якія б сур’ёзна зашкодзілі падсудным. Большасць сведак (настаўнікі, бацькі і вучні) або паводзіла сябе нейтральна, або сцвярджала, што падсудныя не распаўсюджвалі сярод іх беларускіх мап і выданняў, не казалі ім, што Даўгаўпілшчына з’яўляецца часткай Беларусі[1002].

У выніку суд апраўдаў усіх падсудных і не знайшоў у іх дзейнасці віны. У прысудзе сцвярджалася, што: А. Якубецкі і І. Краскоўскі на настаўніцкіх курсах выкладалі прадметы па гісторыі і геаграфіі Беларусі выкарыстоўваючы ўласныя веды і нататкі, а падручнікам А. Смоліча карысталіся толькі як дадатковым матэрыялам з прычыны адсутнасці іншай літаратуры. Тым часам, загад міністра асветы пра забарону карыстацца гэтым падручнікам быў публічна абвешчаны (надрукаваны ва ўрадавым бюлетэні) толькі ў снежні 1924 г. Суд прызнаў, што выкарыстанне ў беларускіх школах мапы Беларусі мела этнаграфічны, а не палітычных характар. Выкарыстанне мапы было прызнана крокам, які тлумачыўся нястачай навучальнай літаратуры. Суд канстатаваў, што БНР існавала непрацяглы час, таму нельга ўсур’ёз разглядаць пытанне яе межаў. Гэта азначала, што мапа не нясе пагрозы для тэрытарыяльнай інтэграцыі Латвіі. Выкладанне ў школах прадметаў гісторыі і геаграфіі Беларусі было прызнана віной Беларускага школьнага аддзела, але не настаўнікаў, якія толькі выконвалі загады. Суд прызнаў, што наяўнасць у некаторых беларускіх настаўнікаў часопіса “На чужыне” не з’яўляецца

[1000] *Беларускі працэс у Латвіі*, “Голас беларуса”, 1925, № 10 ад 28 жніўня, с. 3.

[1001] LVVA, 1612 f., 14 ap., 11 l., 107–112 lpp.; *Беларускі працэс у Латвіі*, “Голас беларуса” 1925, № 13 ад 19 верасня, с. 2.

[1002] *Беларускі працэс у Латвіі*, “Голас беларуса” 1925, № 18 ад 20 лістапада, с. 2.

супрацьзаконным, бо пасля канфіскацыі латвійскімі ўладамі першага нумара яго выданне зноў было дазволена МУС Латвіі. Таму яго пашырэнне ў наступныя гады належала лічыць легальным. Акрамя таго, суд вырашыў, што ў лісце А. Цвікевіча і П. Крачэўскага да І. Краскоўскага пра стварэнне адзінага фронту ішла гаворка не пра фронт узброенай барацьбы, а пра пашырэнне беларускай нацыянальнай свядомасці. У апраўдальным акце адзначалася, што беларускі вызвольны рух, які вызнае ідэю незалежнасці і непадзельнасці Беларусі, звернуты супраць Польшчы і Савецкай Расіі, але не супраць латвійскай дзяржавы, а ўдзел у ім беларускіх настаўнікаў нельга лічыць віной. Суд прызнаў, што ў Латвіі не існавала ніякай беларускай арганізацыі, якая ставіла б за мэту адарванне Латагліі ад латвійскай дзяржавы[1003]. Парадаксальна, але пастанова Латгальскага акруговага суда пра невінаватасць беларускіх дзеячаў дала падставы савецкай прапагандзе ў 1930-я гг. разглядаць яго як чарговы доказ "буржуазна-нацыяналістычнага" і "антысавецкага" характару беларускага руху ў Латвіі[1004].

Следчы А. Лукіньш спрабаваў абскардзіць прысуд. Сваю пазіцыю ён абгрунтоўваў тым, што суд не ўзяў пад увагу сведчанняў У. Корці і Асанава, якія звярталі ўвагу на палітычны характар дзейнасці таварыства "Бацькаўшчына". Следчы лічыў, што сабраў дастатковую колькасць доказаў, што даўгаўпілская арганізацыя з'яўляецца ідэйным працягам менскай. Апрача таго, на палітычны характар дзейнасці беларускага актыву, на яго думку, паказвала тое, што К. Езавітаў як сябра таварыства быў дэлегаваны на І усебеларускую нацыянальную канферэнцыю ў Прагу. А там абмяркоўвалі справы, якія выходзілі далёка за межы культурна-асветных патрэб беларусаў. Следчы сцвярджаў, што культурна-асветная дзейнасць з'яўлялася толькі заслонай, а за ёй беларускі актыў займаўся палітычнай працай, якая пагражала тэрытарыяльнай цэласнасці Латвіі. На думку следчага, лідары латвійскіх беларусаў былі часткай большай палітычнай арганізацыі ("цэнтра"), якая вядзе нацыяналістычную агітацыю на карысць будовы беларускай дзяржавы, у межах якой павінны былі апынуцца Латгалія і Ілукшчына[1005]. Заявы следчага не паўплывалі, аднак, на апраўдальны прысуд.

Нягледзячы на перамогу, працэс меў негатыўныя наступствы. У прынамсі часткі мясцовых беларускіх дзеячаў ён пакінуў пачуцце крыўды і несправядлівасці да латвійскай дзяржавы. Беларускі актыў разглядаў працэс як спробу знішчэння беларускага руху шавіністычнай часткай латвійскай палітычнай сцэны. З'явілася думка задакументаваць працэс і пашырыць

[1003] LVVA, 1612 f., 14 ap., 10 l., 334–339 lpp.; К. Езавітаў, *Беларускі працэс у Латвіі,* Рыга 1926, с. 72; *Беларускі працэс у Латвіі*, "Голас беларуса" 1926, № 2 ад 25 сакавіка, с. 2–3.

[1004] Я. Доўгі, *Беларускі нацыянал-фашызм у Латвіі*, Менск 1933, с. 28–29.

[1005] LVVA, 1632 f., 2 ap., 493 l., 67–71 lpp.

інфармацыю пра яго сярод суродзічаў па-за межамі Латвіі. Галоўным завадатарам выступіў К. Езавітаў, які ў 1925–1926 гг. апублікаваў матэрыялы суда на старонкай сваёй газеты "Голас беларуса". Беларускі дзеяч лічыў працэс паслядоўным працягам "*планавага паходу супраць беларускае школы і ўсяе беларускае меншасці*"[1006]. У 1927 г. ён уклаў і выдаў у Рызе брашуру пад назвай *Беларускі працэс у Латвіі*, на старонках якой падаў уласную версію падзей[1007]. Аўтар сцвярджаў, што следчыя свядома раскручвалі сенсацыйную справу "беларускіх сепаратыстаў", каб такім чынам зрабіць кар'еру і прадэманстраваць грамадству, што яны выкрылі вялікую антыдзяржаўную змову. Беларускі дзеяч вінаваціў следчых у тым, што яны давалі веру фальшывым чуткам і дакументам, якія фабрыкаваліся за мяжой і падаваліся латвійскім пасольствам[1008].

У выніку працэсу спыніла дзейнасць таварыства "Бацькаўшчына". Безумоўную шкоду працэс зрабіў беларускай школьнай справе ў Латвіі. Пасля вобшукаў у школах і затрыманняў настаўнікаў увесну 1924 г. школьная праца на некалькі месяцаў была паралізаваная. Некаторыя дэпутаты Сойма ад Латвійскага сялянскага саюза паставілі пад сумнеў далейшае фінансаванне беларускіх школ, аднак міністр асветы не прымаў гэтага да ведама і тлумачыў сваю пазіцыю неабходнасцю канчатковага высвятлення сітуацыі. Дэпутат ад Латвійскага сялянскага саюза Я. Гольдманіс запатрабаваў ад кіраўніцтва Беларускага аддзела тлумачэння наконт сітуацыі з мапай БНР у беларускіх школах. Пасля інфармацыі пра ператрусы 14 красавіка 1924 г. Бюджэтная камісія Сойма прыняла рашэнне выкрасліць з бюджэту частку выдаткаў на працу БША на наступны навучальны год[1009].

У выніку прыцягнення да адказнасці К. Езавітава і І. Краскоўкага адбыліся змены кіроўнага складу гімназій у Лудзы і Даўгаўпілсе. 10 чэрвеня 1925 г. Міністэрства асветы разгледзела справу закрыцця беларускай гімназіі ў Лудзы. 1 жніўня 1925 г. установа была ліквідаваная. Частка вучняў перайшла ў рускія паралельныя класы[1010]. Рашэнне пра ліквідацыю ўлады тлумачылі змяншэннем колькасці беларусаў у Латвіі (паводле перапісу 1925 г.). Адзначалася таксама, што ў мурах школы знаходзілася шмат вучняў, утрыманне якіх было вельмі дарагім (каля 700 лат на вучня). Беларускі бок

[1006] К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, Рыга 1927 [перадрук: Нью-Ёрк – Менск 2013, с. 112.

[1007] К. Езавітаў, *Беларускі працэс у Латвіі*, Рыга 1927.

[1008] LVVA, 3235 f., 6 ap., 196 l., Рукапіс брашуры К. Езавітава "Беларускі процэс у Латвіі". У іншай сваёй працы К. Езавітаў пісаў, што абвінавачванні грунтаваліся "*на розных плётках, абгаворах ды чутках, распушчаных у Дзвінску расейскімі чарнасоценцамі ды польскімі панамі*". К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, Рыга 1927 [перадрук: Нью-Ёрк – Менск 2013], с. 110.

[1009] *В бюджете белорусского отдела*, "Сегодня" № 88, 15 апреля 1924 г., с. 3.

[1010] *Гістарычны нарыс пяцігодзьдзя Дзьвінскай Дзяржаўнай Беларускай Гімназіі за 1922–1927 г.г.*, укл.: С. Сахараў, Дзьвінск 1927, с. 25.

разглядаў гэты крок як несправядлівы і неабгрунтаваны, скіраваны супраць беларускай меншасці. Падчас перамоў з беларускай дэлегацыяй міністр асветы сцвярджаў, што ў сувязі са змяншэннем бюджэту беларусы не будуць у стане ўтрымаць дзве гімназіі. Міністр прапанаваў перавесці вучняў расфарміраванай гімназіі ў Даўгаўпілскую беларускую гімназію. Беларускі бок лічыў такое рашэнне неадпаведным, паколькі большасць бацькоў не здолее даць дзецям належнай дапамогі ў Даўгаўпілсе. Беларускія актывісты прасілі адкласці рашэнне пра ліквідацыю гімназіі або даць беларусам магчымасць перафарміраваць Лудзенскую гімназію ў прыватную. Бацькі вучняў таксама звярнуліся да таварыства "Беларуская хата" з просьбай у выпадку закрыцця дзяржаўнай гімназіі адчыніць прыватную[1011]. Незадоўга да рашэння аб закрыцці школы, 28 чэрвеня 1925 г., у ёй адбыўся адзіны выпуск[1012]. Былы кіраўнік школы К. Езавітаў лічыў, што ўлады такім чынам паставілі беларусаў перад фактам, не папярэдзіўшы пра намеры аб ліквідацыі[1013]. Нягледзячы на просьбы беларусаў скасаваць рашэнне, улады не пайшлі ім насустрач і 31 жніўня 1925 г. міністр асветы прыняў канчатковае рашэнне аб закрыцці гімназіі. У выніку частка вучняў перайшла ў Лудзенскую латышскую гімназію, іншыя былі вымушаны адмовіцца ад далейшага навучання, а частка (34 чал.) – перайшла ў Даўгаўпілскую беларускую гімназію. Туды быў перададзены таксама інвентар зачыненай школы[1014]. Такім чынам, баталія беларускіх актывістаў за гімназію ў Лудзы скончылася паразай.

Тым часам у Даўгаўпілсе пасля адхілення ад педагагічнай працы І. Краскоўскага выканаўчым абавязкі кіраўніка быў прызначаны У. Пігулеўскі, які 25 траўня 1924 г. роспачна прасіў кіраўніка С. Сахарава ратаваць гімназію, паколькі "*арышты вучыцялёў у канцы года і ў часе экзаменаў ствараюць у гімназіі атмасферу, у якой не можа быць нармальнай працы*"[1015]. 9 кастрычніка 1924 г. часовае кіраванне гімназіяй было даручана П. Жэрдзі. У гімназіі працягвала дзейнічаць педагагічная рада[1016]. Наступствам беларускага працэсу стала выкрэсліванне са спісу прадметаў Даўгаўпілскай беларускай

[1011] *Беларускае жыцьцё*, "Голас беларуса" 1925, № 7 ад 31 ліпеня, с. 4.

[1012] Гімназію скончылі 6 вучняў: Ян Кудраўцоў, Антон Лейтан, Антон Лапаценка, Язэп Мяжэцкі, Якуб Воркуль і Кацярына Зэйгліш. На ўрачыстасці прысутнічаў К. Езавітаў. *Беларускае жыцьцё*, "Голас беларуса" 1925, № 3 ад 1 ліпеня, с. 3.

[1013] *Зачыненьне Люцынскае Беларускае Гімназіі*, "Сын беларуса" 1925, № 5 ад 24 ліпеня, с. 3.

[1014] К. Казачёнок, *"Белорусский процесс" в Латвии: обвинение, оправдание, наказание*, "Латыши и беларусы: вместе сквозь века. Сборник научных статей", ред. М.Г.Королёв, Минск 2012, с. 39.

[1015] LVVA, 2125 f., 5 ap., 251 l., 75 lp.

[1016] У перыяд з кастрычніка 1924 да сакавіка 1925 г. педрада складалася з: П. Жэрдзі, В. Зянкевіча, а. С, Трубіцына, кс. А. Жылініса, У. Радкіна, С. Сахарава, С. Красневіча, Я. Кастылюка і інш.

гімназіі факультатыўных заняткаў “Гісторыя Беларусі”, “Беларуская літаратура” і “Геаграфіі Беларусі”[1017].

Затрыманні і допыты выклікалі непакой сярод вучнёўскай моладзі і бацькоў, у вачах якіх беларускай школьная справа была скампраметавана. Як сцвярджаў У. Пігулеўскі, арышты і ператрусы сярод беларускіх настаўнікаў стварыў у непісьменнага сялянства ўражанне, што запісвацца беларусамі і аддаваць дзетак у беларускія школы можа быць небяспечна[1018]. Пазней У. Пігулеўскі наступным чынам характарызаваў настроі: “*У выніку допытаў сялянскіх дзяцей, вучняў беларускіх сярэдніх школаў, сярод цёмнага, на 70% няграматнага беларускага сялянскага насельніцтва Латгаліі расце насцярога, што абшукоўваюць і судзяць усіх беларускіх настаўнікаў толькі за тое, што яны займаліся ў беларускіх школах, а разам з тым у мэтах бяспекі лічыць патрэбным не пасылаць больш сваіх дзяцей у беларускія школы*”[1019]. Гэты ж дзеяч пісаў, што пад уплывам беларускага працэсу “*частка свядомага нацыянальна беларускага грамадства ў Латгаліі зачынілася ў свае асабістыя скарлупкі і адышла ад актыўнай нацыянальна-культурнай працы, а сярод маласвядомага нацыянальнага грамадства, пераважна сярод сялянства, пачалося масавае ўцяканне ў стан мацнейшых і багацейшых ‘суседзяў’ – палякаў і расейцаў*”[1020].

Клопаты беларусаў выкарысталі іх нядобразычліўцы. 25 жніўня 1924 г. інспектар беларускіх пачатковых школ пісаў у БША: “*Даводжу да Вашага ведама, што ў многіх месцах апошнім часам вядзецца адкрыты напад з боку палякаў і маскалёў процiў беларускіх школ і беларускай культуры. Падымаецца пытанне вышэйпаказанымі фракцыямі аб зачыненні беларускіх школ у Гарадскіх думах; Прапазіцыі гэткія ўносяцца беззаконна, без адпаведных доказаў непатрэбнасці існаваньня беларускіх школ, а галаслоўнымі выпадамі. Прашу Вашага хадатайства перад Міністрам Прасветы і Міністрам Унутранных Спраў аб спыненні такога незаконнага гвалту над беларускімі школамі і беларускай культурай*”[1021]. Беларускі працэс давёў некаторым латвійскім чыноўнікам, што ва ўмовах нізкай нацыянальнай самасвядомасці славянамоўных жыхароў Латгаліі найлепшым выйсцем з’яўляецца перадача школ на нацыянальна-мяшаным абшары ў Агульны школьны дэпартамент[1022]. У перыяд следства з падпарадкавання Беларускага школьнага аддзела было выведзена

[1017] T. Błaszczak, I. Matiash, D. Michaluk, *Iwan Kraskowski (1880–1955). W służbie Białorusi i Ukrainie*, Białystok 2019, s. 175, 179.

[1018] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 56, л. 67.

[1019] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1521; БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 56, л. 29.

[1020] У. Пігулеўскі, *Беларускі Аддзел пры Міністэрстве Асьветы ў Латвіі за 10 год працы* [у:] *Дзесяць год Беларускае Школы ў Латвіі 1921–1931*, Рыга 1932, с. 31.

[1021] LVVA, 2125 f., 5 ap., 146 l., 151 lp.

[1022] LVVA, 1632 f., 2 ap., 493 l. 105–107 lpp.

некалькі школ. У 1923/24 гг. БША страціў сем пачатковых школ, у тым ліку адну на Даўгаўпілшчыне (Кокінскую) і шэсць на Лудзеншчыне (Стара-Слабодскую, Палішчынскую, Даглеўскую[1023], Рагайжскую, Нова-Слабодскую, Рэйкаўскую). У 1924/25 гг. з падпарадкавання БША былі выведзеныя чарговых сем школ, у тым ліку тры на Даўгаўпілшчыне (Шнекаўская, Станкевічаўская, Краслаўская) і чатыры (Зілупская, Пасіенская, Бяляўская, Брадайжская) – на Лудзеншчыне. Акрамя таго, адна школа (Юхнявецкая) у Даўгаўпілскім павеце была зачынена[1024]. Нягледзячы на гэта Беларускі школьны аддзел не пераставаў звяртацца да міністра асветы з просьбай, каб у школы перададзеныя ў распараджэнне Агульнага школьнага дэпартамента прызначаліся настаўнікі латышы і беларусы (у аднолькавай колькасці) з рэкамендацыяй аддзела[1025]. Некаторыя дэпутаты Даўгаўпілскай гарадской думы запатрабавалі закрыцця беларускай асноўнай школы ў Даўгаўпілсе, што аднак не было падтрымана большасцю[1026].

Перыяд следства і працэсу быў часам заняпаду працы Беларускага школьнага аддзела. Пад уплывам нездаровай атмасферы, якая запанавала вакол следства, 24 красавіка 1924 г., спасылаючыся на кепскі стан здароўя, выкліканы стомай ад бесперапыннай 2-гадовай працы, С. Сахараў папрасіў вызваліць яго ад пасады кіраўніка БША[1027]. У часе следства адбыліся толькі два пасяджэнні Рады Беларускага школьнага аддзела[1028]. Згодна з пастановай Рады міністраў 20 лістапада 1924 г., дзейнасць БША была прыпыненая (з 1 снежня)[1029], а яго кіраўнік звольнены з працы[1030]. Такім чынам, беларускія школы часова

[1023] Каб хоць неяк захаваць беларускасць у гэтай школе БША прасіў міністра накіраваць у Дэгелеўскую школу настаўніка-беларуса. НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 44, л. 22.

[1024] LVVA, 2125 f., 5 ap., 333 l., 60–64 lpp.

[1025] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 44, л. 34.

[1026] А. Якубецкі, *Гісторыя разьвіцьця Дзьвінскай Беларускай Асноўнай Школы*, "Голас беларуса" 1926, № 19 ад 1 верасня, с. 3.

[1027] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 106, л. 6.

[1028] 26 ліпеня 1924 г. удзельнікі (С. Сахараў, Р. Плыгаўка, Ф. Астроўскі, П. Жэрдзі, Я. Шчорс, У. Пігулеўскі) разгледзелі наступныя справы: арганізацыя цыклічных летніх курсаў беларусазнаўства для настаўнікаў у Даўгаўпілсе, набор новых кандыдатаў у гімназіі і інш. Адыходзячы на адпачынак, С. Сахараў прапанаваў, каб яго замяніў У. Пігулеўскі. Наступнае пасяджэнне адбылося 29 лістапада 1924 г., на якім прысутнічалі С. Сахараў, У. Пігулеўскі, Р. Плыгаўка, Ф. Астроўскі, Я. Шчорс і В. Зінкевіч. Пасля дакладу кіраўніка ўдзельнікі вырашылі прыняць мемарандум у юрыдычна-прававую камісію ў сувязі з часовым спыненнем працы Беларускага аддзела. LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 24–30 lpp.

[1029] LVVA, 1632 f., 2 apr., 493 l., 45 lp.

[1030] Некаторыя даследчыкі лічаць, што адстаўка С. Сахарава не была непасрэдным наступствам беларускага працэсу. Яшчэ ў студзені 1924 г. І. Краскоўскі выказваў міністэрству незадавальненне працай кіраўніка Беларускага школьнага аддзела. Міністэрства крытычна ацэньвала працу БША, звяртаючы ўвагу на шматлікія хібы ў арганізацыйнай і фінансавай частцы.

былі пазбаўленыя ўласнага кіроўнага органу і падпарадкавана Агульнаму школьнаму дэпартаменту, у якім утварылася Справаводства па беларускіх справах. На пасаду справавода быў прызначаны Р. Плыгаўка, непасрэдным кіраўніком яго з'яўляўся віцэ-кіраўнік Агульнага школьнага дэпартамента Петэрыс Заліціс (*Pēteris Zālītis*)[1031]. На апошняга распараджэннем міністра асветы Карліса Штраўбергса (*Kārlis Straubergs*) № 4561 ад 24 лістапада 1924 г. былі ўскладзеныя абавязкі кіраваць беларускай школьнай справай. Беларускі справавод не меў магчымасці браць удзелу ў пасяджэннях Рады міністраў і наўпрост кантактаваць з міністрам асветы, а рабіў гэта праз кіраўніцтва Агульнага школьнага дэпартамента[1032].

Беларускія дзеячы лічылі, што рашэнне латвійскіх улад спыніць працу Беларускага школьнага аддзела парушае культурную аўтаномію беларусаў. Беларускі актыў спрабаваў дабіцца анулявання рашэння міністра. Рада БША на супольным пасяджэнні з прадстаўнікамі беларускай грамадскасці 21 лістапада абмеркавала сітуацыю і вырашыла звярнуцца праз міністра асветы да старшыні Рады міністраў з просьбай перагледзець рашэнне. На пасаду новага кіраўніка БША ўдзельнікі прапанавалі Р. Плыгаўку. Яны прасілі даручыць дарадцу міністра асветы Яўдземсу ўзяць пад кантроль беларускія школы[1033]. Нязгоду з рашэннем улад адносна Беларускага школьнага аддзела выказалі чальцы педрады Даўгаўпілскай беларускай гімназіі, якія на пасяджэнні 22 лістапада 1924 г. прыняла рэзалюцыю, у якой чытаем: "*Прымаючы пад увагу, што запраўды ходзяць чуткі аб быццам то стаўшымся факце ліквідацыі Аддзела і магчымасці назначэння зверху дырэктара, Педагагічная*

Праведзеная міністэрствам рэвізія выявіла парушэнні ў бухгалтарска-фінансавай дзейнасці аддзела. Было вызначана, што С. Сахараў выдаў 900 лат не ў адпаведнасці з патрэбамі аддзела. У выніку была патрэбна праца чатырох чыноўнікаў, якія працавалі два тыдні, каб давесці да ладу фінансавыя справы аддзела. Чыноўнікі міністэрства адзначалі прагалы ў касавай кнізе, дзе адсутнічалі звесткі пра набыткі. Яны падкрэслівалі, што БША не распрацаваў праграму для пачатковых і сярэдніх школ, у выніку чаго навучальны працэс адбываўся хаатычна. Засцярогі ўрадоўцаў выклікаў факт, што з прычыны безадказнасці кіраўніцтва БША на беларускія настаўніцкія курсы прымаліся асобы з няскончанай сярэдняй і нават пачатковай асветай, што спрычыніла нізкі ўзровень падрыхтоўкі. Чыноўнікі мелі таксама прэтэнзіі да кіраўніка Даўгаўпілскай беларускай гімназіі, які ўвогуле не карыстаўся касавай кнігай, праз што адсутнічала інфармацыя пра выдаткі і закупленыя тавары. БША выплаціў гімназіі пэўныя сродкі на стыпендыі для найбяднейшых вучняў, але не зафіксаваў дадзеную аперацыю ў справаводстве. К. Казачёнок, *"Белорусский процесс" в Латвии: обвинение, оправдание, наказание*, "Латыши и беларусы: вместе сквозь века. Сборник научных статей", ред. М.Г.Королёв, Минск 2012, с. 39–40.

[1031] У. Пігулеўскі, *Беларускі Аддзел пры Міністэрстве Асьветы ў Латвіі за 10 год працы* [у:] *Дзесяць год Беларускае Школы ў Латвіі 1921–1931*, Рыга 1932, с. 29.

[1032] *Аб Беларускім Аддзелі пры Міністэрстве Асьветы*, "Голас беларуса" 1926, № 10 ад 1 ліпеня, с. 1.

[1033] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 44, л. 29.

Рада пастанаўляе: а) прыняць усе крокі супраць ліквідацыі Аддзела і б) пры неабходнасці замены дырэктара прасіць Міністра Прасветы не нарушаць правоў Школьнай Рады ў справе выбару дырэктара. З гэтай мэтай дэлегаваць у Рыгу Мядзёлка-Грыб"[1034]. Аднак у наступныя дні беларусы зразумелі беспаспяховасць сваіх дзеянняў. 29 лістапада Рада Беларускага школьнага аддзела прыняла рашэнне не звяртацца да ўрада з просьбай анульваць рашэнне. Замест гэтага было вырашана ратаваць прынамсі Раду БША, дзеля чаго быў ухвалены звароту да міністра з просьбай не спыняць дзейнасці Рады Беларускага школьнага аддзела як "органа кіравання беларускім нацыянальна-культурным рухам". У пратаколе пасяджэння Рады чытаем: "*Прымаючы пад увагу: а) што Рада Беларускага Аддзела з'яўляецца кіруючым культурна-прасветнай беларускай працай у Латвіі, б) што Рада Беларускага Аддзела існуе на падставе закона аб культурнай аўтаноміі ў Латвіі і карыстаецца правамі, згодна закону аб прасветных установах у Латвіі, настанавіла: прадаўжаць у будучыні сваю дзейнасць і выконваць свае функцыі. Чарговае пасяджэнне Рады Аддзела склікаць 3–4.I.25 г.*"[1035]. Аднак гэта не паўплывала на пазіцыю ўлад, а Рада падзяліла лёс аддзела. У сувязі са следствам быў перанесены чарговы з'езд беларускага настаўніцтва – з верасня 1924 г. на перыяд калядных свят[1036]. Нягледзячы на негатыўныя для беларускіх школ змены, яны не азначалі канца школьнай аўтаноміі, што працягвала існаваць у новых умовах.

Наступствам беларускага судовага працэсу было выдаленне з Латвіі настаўнікаў, якія з'яўляліся грамадзянамі іншых дзяржаў. Яшчэ 25 ліпеня 1924 г. частка настаўнікаў-іншаземцаў была звольнена з працы. 15 студзеня 1925 г. І. Краскоўскі быў пазбаўлены права на педагагічную працу ў Латвіі. Яго лёс падзялілі іншыя педагогі-іншаземцы. Беручы пад увагу іх высокую педагагічную падрыхтоўку, Рада БША хадайнічала перад міністрам асветы, каб дазволіў пакінуць на працы частку замежнікаў, у тым ліку: А. Якубецкага, А. Якубецкую, С. Казеку, А. Дварэцкага, П. Жэрдзі, С. Сіцько, І. Краскоўскага, П. Мядзёлку-Грыб і Ф. Еленеўскую[1037]. Ім пагражала дэпартацыя з Латвіі. Прыхільнікам выдалення беларускіх настаўнікаў з краіны з'яўляўся следчы В. Азоліньш, які яшчэ 22 кастрычніка 1924 г. сцвярджаў, што І. Краскоўскі, А. Якубецкі і П. Мядзёлка-Грыб працягваюць займацца антыдзяржаўнай працай[1038]. 15 красавіка 1925 г. Палітычнае ўпраўленне паліцыі падрыхтавала службовую нататку, у якой адзначалася, што,

---

[1034] LVVA, 2067 f., 1 ap., 367 l., 78–79 lpp.

[1035] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 24–30 lpp.; НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 107, л. 24.

[1036] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 167, л. 11.

[1037] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 26 lp.

[1038] LVVA, 1632 f., 2 apr., 493 l., 111 lp.

нягледзячы на апраўдальны прысуд, беларусаў-іншаземцаў А. Якубецкага, І. Краскоўскага і П. Мядзёлку-Грыб належыць дэпартаваць, бо яны з'яўляюцца часткай беларуска-камуністычнага руху, які імкнецца аб'яднаць беларусаў у Польшчы і краінах Балтыі[1039]. У выніку МУС вырашыла выдаліць з краіны ў адміністрацыйным парадку трох вышэйзгаданых настаўнікаў. Беларускі бок апратэставаў рашэнне. 4 траўня 1925 г. таварыства "Беларуская хата" (за подпісам кіраўніка М. Дзямідава) накіравала мемарыял да міністра асветы і міністра-прэзідэнта Латвіі, у якім прасіла адклікаць рашэнне аб дэпартацыі. Асабліва аўтары прасілі пакінуць у Латвіі П. Мядзёлку-Грыб, якая плённа працавала над стварэннем беларускага народнага тэатра ў Латвіі і без якой тэатральная справа была б спыненая на некалькі гадоў. 6 траўня 1925 г. падобны мемарыял да міністра-прэзідэнта выдала таварыства "Рунь" (кіраўнік Я. Шчорс): аўтары прасілі дазволіць беларускім настаўнікам папрацаваць у Латвіі яшчэ 2–3 гады, пакуль слухачы беларускіх настаўніцкіх курсаў цалкам не заменяць іншаземных педагогаў у беларускіх школах[1040]. Сябры ўправы таварыства "Рунь" прасілі таксама скасаваць рашэнне пра высылку з Латвіі настаўнікаў І. Краскоўскага і А. Якубецкага. У дакуменце канстатавалася, што "беларускі працэс" моцна зашкодзіў беларускай меншасці і пагоршыў яе нацыянальна-культурную сітуацыю[1041].

Аўтары абодвух мемарыялаў падкрэслівалі сваю лаяльнасць да латвійскай дзяржавы, пераконваючы, што абвінавачанні беларусаў у антыдзяржаўнай дзейнасці з'яўляюцца падкопамі варожых сіл: "*Зная, что упомянутое дело создано не Латвийским Правительством, а нашими врагами, мы спокойно ждали его конца, веруя, что судебный разбор раскроет глаза Латвийскому народу и убедит его в том, что мы, белоруссы, отнюдь не являемся элементом антигосударственным, что, более того, мы не можем даже быть в традиционной меньшинственной опозиции к латышскому большинству, ибо у нас нет и не может быть 'общего фронта' с другими меньшинствами, ибо мы в среде самих меньшинств есть 'опозиция', ибо мы вынуждены воевать с самими, казалось бы, близкими к нам меньшинствами, поляками и великоруссами, за сохранение своего национального лица и в этой нашей борьбе можем опираться только на латышское большинство, только на поддержку и защиту Латвийского Правительства*"[1042].

Аднак латвійскія ўлады не ўзялі пад увагу просьбы беларускіх дзеячаў. У выніку краіну пакінулі І. Краскоўскі (выехаў у Чэхаславакію) і П. Мядзёлка-

---

[1039] LVVA, 3235 f., 2 ap., 3437 l., 18 lp.

[1040] LVVA, 3235 f., 2 apr., 3437 l., lp. 24–27; *Высяленьне гр. гр. І. Краскоускага, П. Мядзёлка-Грыб і А. Якубецкага з Латвіі*, "Голас беларуса" 1925, № 1, с. 2–3.

[1041] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1007 l., 40 lp.

[1042] LVVA, 3235 f., 2 apr., 3437 l., 27 lp.

Грыб (выехала ў БССР). Кастусь Езавітаў разглядаў іх выдаленне з краіны як вялікі ўдар па беларускай меншасці. Віну за гэта ён ускладаў на латвійскае МУС, якое, на яго думку, бачыла ў беларускім руху ворага Латвіі. Ён лічыў гэтыя дзеянні памылкай, якая адштурхне беларусаў ад латвійскай дзяржавы. Як сцвярджаў беларускі дзеяч, Міністэрства асветы не хоча зразумець, што судовы працэс быў вынікам усяго толькі інтрыг "некалькіх паліцэйскіх чыноўнікаў ахранкі"[1043]. Разам з тым, дэпартацыі ўдалося пазбегнуць А. Якубецкаму, за якога хадайнічалі Педрада і вучні Даўгаўпілскай беларускай гімназіі[1044]. Больш за тое, 4 лістапада 1925 г. Рада міністраў дазволіла яму быць настаўнікам Даўгаўпілскай беларускай гімназіі[1045].

Палітычная паліцыя раіла дэпартаваць таксама К. Езавітава спасылаючыся на тое, што ён незаконна атрымаў грамадзянства Латвіі. Аднак верыфікацыйная камісія не бачыла падстаў лічыць памылковым рашэнне аб наданні латвійскага падданства[1046]. Паліцыя настойвала, што К. Езавітава належыць лічыць асобай, якая варожа ставіцца да латвійскай дзяржавы[1047].

Спрэчным пытаннем з'яўляецца ўплыў працэсу на вынікі ўселатвійскага перапісу насельніцтва 1925 г. Нагадаем, што ў дзяржаўных статыстыках колькасць латвійскіх беларусаў у перыяд з 1920 па 1925 гг. скарацілася ўдвая. У беларускіх крыніцах распаўсюджана меркаванне, што працэс быў галоўнай прычынай радыкальнага памяншэння колькасці асоб, якія дэкларавалі беларускую нацыянальнасць. Паводле беларускіх дзеячаў, гэта адбылося пад уплывам атмасферы страху, якую ў беларускім грамадстве выклікала следства і працэс[1048]. На наш погляд, тыя ўплывы перабольшаныя. Па-першае, яны не знаходзяць падмацавання ў крыніцах. Па-другое, немагчыма патлумачыць такія значныя статыстычныя змены псіхалагічным уздзеяннем судовага працэсу, які тычыўся нешматлікай групы актывістаў. Не адмаўляючы таго, што маглі здарацца выпадкі, калі хтосьці не жадаў задэкларавацца беларусам пад

[1043] У лісце пражскім беларусам (13 ліпеня 1925 г.) К. Езавітаў адзначаў: "*Аднак, трэба прызнаць, што ў гэтым ад'ездзе больш усіх вінна Міністэрства Унутраных Спраў Латвіі, якое ўсё яшчэ бачыць у беларускай меншасці сабе ворагаў і само адпіхівае нас і міма нашае волі сварыць нас з латышамі. Дужа памылковая палітыка. Мы ўвесь час былі найбольш лаяльнымі і найменш апазіцыйнымі з меншасцяў. Міністэрства ніяк не можа зразумець, што нас проста справацыравала некалькі чыноўнікаў палітычные ахраны, якія хацелі зрабіць на беларусах сабе кар'еру*". ГАРФ, ф. 5875, оп. 1, д. 11, л. 433.

[1044] *Да высяленьня гр.гр. Я. І. Краскоўскага, П. Мядзёлка-Грыб і А. Якубецкага з Латвіі*, "Голас беларуса" 1925, № 2 ад 20 чэрвеня, с. 2.

[1045] У сувязі з гэтым школьная рада беларускай пачатковай школы ў Даўгаўпілсе на яго месца абрала настаўніка А. Барткевіча. Гэта адбылося насуперак пратэсту К. Александровіча, які адмоўна ахарактарызаваў А. Барткевіча. LVVA, 2125 f., 5 ap., 126 l., 72 lp.

[1046] LVVA, 1632 f., 2 ap., 4752 l., 14 lp.

[1047] LVVA, 1632 f., 2 ap., 4752 l., 10 lp.

[1048] К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі...*, с. 20.

уплывам грамадскай думкі, але складана ўявіць, што так зрабіў кожны другі жыхар, які пяць гадоў раней запісаўся або быў запісаны беларусам. Такім чынам, можна дапусціць, што беларускі працэс калі і меў уплыў на вынікі перапісу 1925 г., то ў нязначнай ступені.

Нельга не запытацца аб прычынах, якія прывялі да следства і працэсу над беларускім актывам. Шукаючы матываў дзейнасці латвійскіх улад, належыць узяць пад увагу шэраг фактараў. Бясспрэчным з'яўляецца тое, што ў сярэдзіне 1920-х гг. можна было назіраць пэўны недавер з боку часткі прадстаўнікоў улады да беларускай меншасці. Некаторыя даследчыкі схільныя бачыць у гэтым гістарычна абумоўлены недавер латышоў да славян[1049]. Пэўную ролю адыграла ўзаемнае няведанне паміж латышамі і беларусамі. Беларускі нацыяналізм быў з'явай новай як у Латвіі, так і наогул, шмат хто з латвійскіх палітыкаў не ведаў, чаго ад яго чакаць і якую пагрозу ён можа ўяўляць для маладой латвійскай дзяржавы. Беларускамоўная літаратура перыяду БНР (які ў гісторыі беларусаў быў часам нацыянальна-культурнага адраджэння) у беларускіх школах Латгаліі ўспрымалася мясцовымі беларускімі дзеячамі як рэч цалкам натуральная і пажаданая. Гэтыя людзі адчувалі сябе не толькі настаўнікамі, але піянерамі беларускай справы, якія ў шчырым імкненні прашчапіць моладзі нацыянальную свядомасць выкарыстоўвалі ўсе даступныя сродкі. Тым часам у вачах латвійскіх урадоўцаў тыя падручнікі і мапы маглі выглядаць падазронымі і патэнцыйна небяспечнымі. Асабліва неабходна ўзяць пад увагу тое, што гэта адбывалася ў рэгіёне, які вылучаўся высокім адсоткам нелатвійскага насельніцтва. Нельга не пагадзіцца з Эрыксам Екабсонсам, які лічыць, што дзеянні латвійскіх улад былі адэкватныя і зразумелыя. З назіранняў паліцыі вынікала, што сярод пэўнай часткі беларусаў Латгаліі сапраўды панавалі настроі, якія не маглі не выклікаць засцярогі ў латвійскіх улад[1050].

Апраўдальны прысуд не азначаў, што ўлады перасталі цікавіцца настроямі беларускага актыву. Стаўленне да беларускага руху яскрава адлюстроўваюць крыніцы Палітычнага ўпраўлення паліцыі. Яго супрацоўнікі назіралі сярод беларускай меншасці праявы дзейнасці, якая магла ствараць небяспеку дзяржаве. Аналіз гэтых крыніц дазваляе меркаваць, што лаяльнасць і палітычная надзейнасць некаторых беларускіх актывістаў ставілася пад сумнеў. 20 траўня 1925 г. даўгаўпілскі аддзел палітычнай паліцыі інфармаваў кіраўніцтва аб тым, што ў Латгаліі існуе беларускі рух на чале з К. Езавітавым, які мае на мэце адарваць ад Латвіі частку Латгаліі і далучыць да Беларусі.

[1049] I. Alpine, *Baltkrievi Latvija*, Rīga 1995, s. 28; К. Казачёнок, *"Белорусский процесс" в Латвии: обвинение, оправдание, наказание*, "Латыши и беларусы: вместе сквозь века. Сборник научных статей", ред. М.Г.Королёв, Минск 2012, с. 42.

[1050] LVVA, 1632 f., 2 apr., 493 l., 96, 98 lpp.

Пры гэтым падкрэслівалася, што 25 траўня, падчас сходу беларускага актыву (20–25 настаўнікаў) у Даўгаўпілскай беларускай гімназіі, беларускі дзеяч непрыхільна выказваўся наконт прадстаўнікоў латвійскіх улад[1051]. Каб узяць удзел у сходзе, К. Езавітаў адмыслова прыехаў з Рыгі, а падчас сваёй прамовы распавёў пра таварыства "Беларуская хата"і яго ролю ў пашырэнні беларускай культуры. Пры гэтым ён раскрытыкаваў урад і МУС, які, на яго думку, верыць плёткам, а не фактам. І заклікаў прысутных да непадпарадкавання МУС[1052]. У кантэксце вышэйзгаданага не павінна здзіўляць, што пасля суда К. Езавітаў не займаў ніякіх кіроўных пасад у дзяржаўных установах і школах. Улады маглі пагадзіцца толькі на тое, каб ён займаў пасаду шараговага настаўніка. Беларускі дзеяч мусіў засяродзіцца на працы ў недзяржаўных структурах.

Прынамсі частку беларускіх грамадскіх дзеячаў і настаўнікаў беларускіх школ дзяржаўныя цывільныя і паліцэйскія органы падазравалі ў палітычнай ненадзейнасці. 20 студзеня 1926 г. кіраўнік Даўгаўпілскага павета звяртаў увагу міністра асветы на тое, што беларускія школы на Прыдруйшчыне і Пустыншчыне з'яўляюцца асяродкамі антыдзяржаўнай беларускай сепаратысцкай думкі, якую пашыраюць настаўнікі: на Прыдруйшчыне – П. Мірановіч, Я. Камаржынскі, М. Талерка, Э. Вайводзіш, на Пустыншчыне – Ф. Астроўскі, Лідзія Заліўская і Алена Сушчыцкая. Брат апошняй знаходзіўся ў Менску і працаваў у тамтэйшых арганізацыях. У дакуменце сцвярджалася, што настаўнікі вядуць антыдзяржаўную агітацыю ў навакольных вёсках, а гэта з прычыны блізкасці мяжы з Савецкай Беларуссю стварае рэальную пагрозу латвійскай дзяржаве. Чыноўнік падкрэсліваў, што пасля апраўдальнага прысуду мясцовая паліцыя не можа эфектыўна змагацца з беларускім сепаратызмам, бо паводле закона беларускі актыў нявінны. Аўтара непакоіў факт, што большасць беларускіх настаўнікаў не ведае дзяржаўнай мовы. У сувязі з тым ён прасіў Міністэрства асветы накіроўваць у беларускія школы больш надзейных настаўнікаў[1053].

У красавіку 1926 г. МУС Латвіі звяртала ўвагу Міністэрства асветы, што "*беларуская сепаратысцкая думка і дзейнасць у памежных раёнах шторазу пашыраецца. Яе цэнтры – мясцовыя школы (...) большая іх* [настаўнікаў – ЕГ] *частка не разумее дзяржаўнай мовы і патрабуе латышскіх школаў з расійскай мовай навучання. Паліцэйскім чыноўнікам даводзіцца весці барацьбу з 50 беларускімі настаўнікамі, якія цалкам настроеныя па-антыдзяржаўнаму, а барацьбу з імі ўскладняе і робіць амаль немагчымай факт, што суд у свой час вынес апраўдальны прысуд па 'беларускай справе', а ўсе настаўнікі*

[1051] LVVA, 1632 f., 2 apr., 4752 l., 1 lp.
[1052] LVVA, 1632 f., 2 apr., 4752 l., 5 lp.
[1053] LVVA, 1632 f., 2 ap., 493 l., 6 lp.

і з'яўляюцца тымі самымі людзьмі, што былі падсуднымі і апраўданымі"[1054]. Верагодна, такое меркаванне было выпрацавана пад уплывам наяўнасці ў многіх беларускіх настаўнікаў сваякоў на іншы бок мяжы – у БССР, з якімі яны падтрымлівалі адносіны. Улады асцерагаліся, што ідэя далучэння Латгаліі да Савецкай Беларусі можа знайсці разуменне сярод гэтых людзей. Непакой прадстаўнікоў латвійскай дзяржавы быў абгрунтаваны. Большасць беларускіх дзеячаў рэалістычна глядзела на сваю справу, ведаючы, што ў бягучай геапалітычнай сітуацыі змена дзяржаўнай прыналежнасці паўднёвай Латгаліі немагчымыя. Аднак гэта не азначае, што ў глыбіні душы яны не хацелі бачыць яе ў межах Беларусі – савецкай альбо несавецкай[1055].

Пра інтэнсіўнасць назіранняў дзяржаўных органаў за беларускім актывам сведчыць факт, што іх увагу выклікалі нават зацемкі друкаваныя ў "Літаратурным кутку" газеты "Голас беларуса". Так, насцярожаную рэакцыю дзяржаўных чыноўнікаў выклікалі радкі з вершаў В. Казлоўскай *Разведчыку*[1056] і К. Езавітава (пад псеўданімам "Кастусёнак") *Ня ный! – Ня плач!* і *Братам Заходняй Беларусі*[1057]. Увагі заслугоўвае інцыдэнт, які адбыўся ўлетку 1926 г. на Краслаўшчыне. 25 чэрвеня адзін з мясцовых жыхароў Віктар Бенядыкт Бука вывесіў беларускі сцяг[1058]. Гэта занепакоіла мясцовую паліцыю, якая зацікавілася справай і вырашыла вызначыць погляды Букі і разабрацца, які сцяг ён вывесіў – Савецкай Беларусі ці нейкі іншы. У выніку допытаў сведкаў высветлілася, што падазраваны не займаў варожай пазіцыі ў дачыненні да Латвіі і не ўдзельнічаў у антыдзяржаўнай працы, а сцяг з'яўляўся беларускім нацыянальным штандарам з 1918 г. У выніку паліцыя не палічыла паводзіны беларуса небяспечнымі для латвійскай дзяржавы[1059].

Беларускі працэс завяршыў чарговы этап у гісторыі грамадска-культурнай актыўнасці беларускай меншасці ў Латвіі. Падсумоўваючы вынікі беларускай працы ў 1921–1925 гг., варта адзначыць, што гэты перыяд з'яўляўся вельмі важным у працэсе афармлення беларускай нацыянальна-культурнай аўтаноміі. Са з'яўленнем таварыства "Бацькаўшчына" і іншых культурна-асветных

[1054] Цыт. за: К. Казачёнок, *"Белорусский процесс" в Латвии: обвинение, оправдание, наказание*, "Латыши и беларусы: вместе сквозь века. Сборник научных статей", ред. М.Г. Королёв, Минск 2012, с. 38.

[1055] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 233–238 lpp.

[1056] Насцярогу чыноўнікаў выклікалі словы: "За шчасце згвалчанай Айчызны, Свой посах сціснуўшы у далонь, У думках і ў сэрцу чысты, Гатовы будзь пайсьці ў агонь!". LVVA, 1632 f., 2 apr., 4752 l., 11a lp.

[1057] Гаворка ішла пра словы: "Бей, рэж, палі, – хай й хаты ворагаў згараць!". LVVA, 1632 f., 2 apr., 4752 l., 11a lp.

[1058] LVVA, 3235 f., 2 apr., 1707 l., 6 lp.

[1059] LVVA, 3235 f., 2 apr., 1707 l., 14 lp.

арганізацый пачалася арганізацыйная праца латвійскіх беларусаў. Яе галоўным вынікам было стварэнне беларускіх школ у Латвіі. З'яўленне Беларускага школьнага аддзела ў Міністэрстве асветы надало беларускай школьнай справе арганізаваны характар і давала істотную матэрыяльную базу. Ані перад гэтым, ані ў наступныя гады мясцовыя беларускія школы не мелі такіх добрых вынікаў. Цяжка пераацаніць карысць нацыянальна-асветнай працы ў згаданы час як для беларускай меншасці ў Латвіі, так і ў агульнабеларускім маштабе. Паступова Латвія ператварылася ў буйны асяродак беларускага нацыянальнага жыцця. У 1923 г. у краіне, дзе пражывала некалькі дзясяткаў тысяч беларусаў, колькасць беларускіх пачатковых школ дасягнула 50. У разгар працы ў беларускіх школах навучалася 3 629 вучняў і працавалі 153 настаўнікі (130 – у пачатковых школах і 23 – у гімназіях)[1060]. Паводле іншых крыніц, у 1922/23 гг. налічвалася 54 беларускія пачатковыя і 2 сярэднія школы, у якіх вучылася 3 629 вучняў і працавала 158 настаўнікаў[1061].

У 1921–1925 гг. быў закладзены трывалы падмурак пад далейшую нацыянальна-асветную і культурную дзейнасць беларускай меншасці ў Латвійскай Рэспубліцы. Менавіта першыя гады працы былі найбольш плённымі ў сэнсе падрыхтоўкі кадраў мясцовай маладой беларускай інтэлігенцыі. Значная колькасць выхаванцаў беларускіх школ праявіла нацыянальны запал і творчы талент. У пазнейшыя гады гэтыя людзі далучыліся да беларускай дзейнасці ў Латвіі і па-за яе межамі. А вось якім чынам першыя пяць гадоў беларускай дзейнасці ў Латвіі падсумавала газета "Голас беларуса": "*Уступаючы ў шосты год нашае нацыянальна-адраджэнчае працы ў Латвіі, мы з гонарам можамо аглядзецца на пройдзены шлях і адважна і спакойна паглядзець у будучыню. Нягледзячы на перашкоды, мы зрабілі нямала. Іншыя больш мацнейшыя і раней за нас з'арганізаваныя нацыянальныя меншасці Латвіі не вельмі многа паспелі нас абагнаць, хаця ж праца іх праходзіла ў больш спрыяючых абставінах і пры большым ліку кваліфікаваных сіл*"[1062].

З'яўленне і развіццё беларускай нацыянальна-культурнай аўтаноміі было абумоўлена двума фактарамі: 1) дэмакратычным ліберальным заканадаўствам Латвіі і 2) наяўнасцю ў краіне групы беларускіх нацыянальных актывістаў. Латвійская дзяржава стварыла юрыдычныя і матэрыяльныя ўмовы, якія дазвалялі грамадска-палітычную і культурна-асветную дзейнасць нацменаў. Галоўную ролю ў арганізацыі беларускага жыцця ў Латвіі адыграў К. Езавітаў. Менавіта ён узяў на сябе асноўны цяжар арганізацыйнай працы. З упэўненасцю можна сцвярджаць, што без яго з'яўленне беларускага руху ў Латвіі было б немагчыма.

[1060] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 56, л. 59; АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1525.

[1061] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 107, л. 2.

[1062] *Беларусаў Латвіі вітаемо з 5-цігодзьдзем нашае нацыянальна-адраджэнчае працы*, "Голас беларуса" 1926, № 19 ад 1 верасня, с. 1.

РАЗДЗЕЛ III

Ад рэактывацыі да ліквідацыі. Другі этап культурна-асветнай аўтаноміі (1925–1934)

Культурна-асветныя арганізацыі

Адной з праяў арганізацыйнай працы на нацыянальнай ніве пасля 1925 г. была дзейнасць культурна-асветных таварыстваў. Патрэбу разбудовы такіх арганізацый усведамлялі кіраўнікі і ўдзельнікі мясцовага беларускага руху. У 1926 г. маладая актывістка Ніна Пінская на старонках газеты "Гаспадар" наступным чынам заклікала суайчыннікаў да самаарганізацыі: "*Мы, беларусы, таксама, як і ўсе іншыя, плацімо падаткі і паборы, а таму, ясна, маемо права і атрымліваць дапамогу. Дык у чым жа прычына нашага вышчэрбу? Ці нам не даюць? Не! Мы, беларусы, іх не ўмеемо ўзяць, не ведаем, як падысці да гэтае рэчы. І тут якраз мы яскрава бачымо ўсю моц і неабходнасць аб'яднання; яскравы жыццёвы прыклад паказвае нам, што нічога мы, беларусы не дасягнем, калі будземо ісці і далей кожны сваім шляхам. Цяжкія абставіны апошняга часу, здаецца, зусім не надалі нам розуму, тым часам даўно пара адкінуць усё іншае ў бок і паставіць сабе перад вачыма адну мэту: аб'яднанне. Калі мы адзіным шчыльным заслугоўваючым павагі фронтам зрушым і закладзем хоць бы пачатак якому-колечы пэўнаму культурнаму пачынанню, дык той самы Культурны Фонд будзе змушан самой істотнай справы задаволіць нашыя справядлівыя вымаганні. Аб'яднаныя – мы мусімо адкінуць часткова пагардлівае адношанне да нас іншых нацыянальнасцяў і змусімо іх лічыцца з намі, як лічацца з кожнай, узброенай моцам адзінства, праявай. Аб'яднанне павінна запанаваць зараз, у гэты цяжкі час для нас, беларусаў, час нядолі. Бліжэй да яго, браты*"[1]. У падобным духу выказвалася рэдакцыя перыёдыка "Беларуская школа ў Латвіі", на старонках якога чытаем: "*Кожны*

[1] Н. Пінская, *Што згубілі беларусы, дзякуючы адсутнасьці аб'еднаньня*, "Гаспадар" 1926, № 3, с. 33.

беларус павінен прымаць самы чынны і гарачы ўдзел у нашым беларускім, нацыянальна-адраджэнчым руху. Кожны селянін, кожны рабочы, кожны настаўнік – павінен дапамагаць беларускаму адраджэнню ўсімі сваімі сіламі. Кожны павінен рабіць тое, што ён па сваіх здольнасцях і магчымасцях можа зрабіць. Кожны беларус павінен чытаць сваю газету і кнігу, купляць і пашыраць іх, бо гэтым ён пашырае і ўмацоўвае беларускі рух. Кожны беларус павінен быць сябрам беларускіх нацыянальных арганізацыяў і дапамагаць ім у іхняй працы. Не павінна быць такіх беларусаў, якія гаварылі б: 'Мая хата з краю!', або 'І без мяне абойдзецца!' Хто так думае або гавора, той адракаецца свайго роднага, беларускага, і такога чалавека мы павінны лічыць здраднікам нашае беларускае працы. Беларускія школы, беларускія кааператывы, беларускія нацыянальныя таварыствы і арганізацыі павінны дружна падтрымоўвацца ўсімі беларусамі. У аб'яднанні – сіла! Яднаючыся каля сваіх беларускіх арганізацый, мы знойдзем сабе ідэёвую працу і ўмацуем культурнае і эканамічна-сацыяльнае становішча беларускага народа"[2].

Дадзеныя словы былі падмацаваны канкрэтнымі справамі. У другой палове 1920-х гг. у Латвіі назіраўся рост актыўнасці беларускіх культурна-асветных таварыстваў. Ліквідацыю таварыства "Бацькаўшчына" кампенсавала стварэнне шэрагу новых арганізацый культурна-асветнага характару. Акрамя таго, у разгляданы час працягвалі дзейнасць ужо існыя таварыствы. Варта зрабіць агляд стварэння і дзейнасці беларускіх культурна-асветных таварыстваў у той час. У разгляданы перыяд працягвала працу **Беларускае культурна-асветнае таварыства "Беларуская хата"**, асноўным месцам актыўнасці якога з'яўлялася Рыга. Найінтэнсіўней арганізацыя дзейнічала ў 1925–1926 гг. З красавіка 1925 па студзень 1926 гг. рэгулярна адбываліся пасяджэнні ўправы арганізацыі (разам 65). З часам заўважна павялічылася колькасць сяброў таварыства. Восенню 1925 г. у шэрагах арганізацыі налічвалася 160 сяброў, а на пачатку 1930-х гг. іх было 600. Разам з тым, назіралася значная ратацыя: частка сяброў не плаціла складкі і іх за гэта выключалі з арганізацыі. Найбуйнейшым аддзелам з'яўляўся Саркандаўгаваўскі, дзе ў студзені 1929 г. налічвалася 155 сяброў. Аднак да канца года 139 асоб было пазбаўлена сяброўства праз неаплату складак. За гэты час аддзел папоўніўся 35 новымі сябрамі, а некаторыя былі адноўлены ў сяброўстве. У выніку на пачатку 1930 г. у аддзеле было толькі 68 дзейных сяброў. Таварыства "Беларуская хата" яднала прадстаўнікоў розных сацыяльных груп. Пераважную большасць сяброў сталічных аддзелаў складалі рабочыя і настаўнікі беларускіх школ. Тым часам у латгальскіх аддзелах быў пэўны адсотак сялян[3].

---

[2] Настаунік-Беларус, *Браты Беларусы!*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1927, № 6(4), с. 79.

[3] У 1931 г. кіроўны склад таварыства быў наступны: М. Дзямідаў (старшыня), К. Езавітаў (намеснік старшыні), Р. Плыгаўка (скарбнік), А. Родзька (сакратар), С. Сіцько (сябра).

У перыяд беларускага працэсу, калі спынілі сваю працу Беларускі школьны аддзел і таварыства "Бацькаўшчына", таварыства "Беларуская хата" ўзяло на сябе абавязкі абароны інтарэсаў беларускай меншасці ў кантактах з латвійскімі ўладамі. Аднак галоўным напрамкам дзейнасці заставаўся культурна-асветны, які рэалізоўваўся ў арганізацыі культурных мерапрыемстваў. Таварыства стварала хоры і аркестры, бібліятэкі, ладзіла публічныя лекцыі і вечарыны, моўныя і агульнаадукацыйныя курсы для насельніцтва. Нягледзячы на гэта, беларускія дзеячы лічылі, што мерапрыемствы ў Рызе застаюцца па-за ўвагай латвійскай грамадскасці і прэсы. Таму з мэтай азнаямлення жыхароў латвійскай сталіцы з беларускасцю было вырашана 27 і 28 кастрычніка 1929 г. правесці дні беларускай культуры. У гэтыя дні адбыліся лекцыі, выступы хору і тэатральныя пастаноўкі[4].

Аналіз стану бюджэту таварыства паказвае, што асноўны прыбытак (каля 80%) арганізацыя мела з арэнды будынка, дзе месцілася сядзіба. Памяшканні здавалі ў арэнду пад школу, кінатэатр, курсы, кватэры на трэцім паверсе, і дзякуючы гэтаму таварыства мела сталы прыбытак. Астатнюю частку прыбытку складала дапамога БША, выручка з вечарын, сяброўскія складкі і інш. Акрамя таго, арганізацыю падтрымлівалі некаторыя беларускія дзеячы, даючы пазыкі (напрыклад, К. Езавітаў пазычыў – 1 042 латы; гэты доўг быў яму вернуты ў 1929 г.)[5].

Таварыства не забывалася і пра культурна-асветную працу на правінцыі. Увесну 1926 г. "Беларуская хата" адчыніла ў Даўгаўпілсе першую ў Латвіі беларускую бібліятэку-чытальню. Мясцовая прэса пісала, што бібліятэку наведвала значная колькасць чытачоў, але яе працу ўскладняла нястача грошай[6]. У 1929 г. пачаў працу аддзел таварыства ў Ліепаі, пры якім была створана бібліятэка імя Івана Луцкевіча. Кіраўніцтва таварыства планавала арганізаваць у горадзе беларускую школу. У 1930 г. таварыства "Беларуская хата" заснавала бібліятэку-чытальню ў Старой Слабадзе, а таксама зладзіла курсы беларусазнаўства ў Лудзы (16 слухачоў), падчас якіх было прачытана 28 лекцый[7]. Таварыства ўзяло ўдзел у арганізацыі Дзён беларускай культуры, стварыла хор, закупіла грамафон, які выкарыстоўваўся падчас вечарын[8]. Напрыканцы 1920-х г. быў адчынены аддзел у Торнкальне, які разгарнуў тэатральную дзейнасць (ставіліся п'есы *На Антокалі*, *Паўлінка*)[9].

---

[4] *Дні Беларускае Культуры ў Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1929, № 9(1), с. 1.

[5] LVVA, 2125 f., 5 ap., 11 l., 40 lp.

[6] *Адозва да беларускага грамадзянства*, "Школьная праца" 1926, № 3–4, с. 30; *Да адчыненьня першае беларускае бібліятэкі-чытальні ў м. Дзьвінску*, "Голас беларуса" 1926, № 11 ад 7 ліпеня, с. 2.

[7] LVVA, 2125 f., 5 apr., 13 l., 22 lp.

[8] LVVA, 2125 f., 5 ap., 11 l., lp. 41.

[9] *4-я Уселатвійская нарада прадстаунікоў усіх арганізацый беларускае меншасьці у Латвіі*, "Голас беларуса" 1929, № 1 ад 29 красавіка, с. 1.

Намаганнямі таварыства ладзіліся лекцыі і вечарыны. Напрыклад, 25 траўня 1930 г. у Даўгаўпілсе арганізацыя правяла "беларускі народны сход" з удзелам У. Пігулеўскага і К. Езавітава, якія выступілі з рэфератамі *Праца ў Сойме* і *Беларускі рух у Латвіі і наогул*. Пасля выступаў была пастаўленая п'еса *Калісь*[10]. 18 траўня 1930 г. таварыства зладзіла ў Марцішах "Гуляньне ў зелені" з удзелам вучнёўскага хору пад кіраўніцтвам М. Іванова. Праграма прадугледжвала таксама танцы і канцэрт духавой музыкі[11]. У планах арганізацыі на 1931 год было: актыўны ўдзел у дзейнасці па захаванні беларускіх школ у Істэрскай воласці, стварэнне на Лудзеншчыне (у Ляўдарскай, Залескай і Шушкаўскай валасцях) курсаў беларусазнаўства, адкрыццё беларускай школы ў Ліепаі[12].

Істотным дасягненнем таварыства "Беларуская хата" было адкрыццё ў Даўгаўпілсе ў 1930 г. і ўтрыманне беларускага дзіцячага садка. Рашэнне стварыць садок было прынята ўдзельнікамі нарады беларускіх арганізацый Даўгаўпілса, на якой справа была даручана таварыству "Беларуская хата". Установа знаходзілася на Старым Фарштаце па адрасе *Valmeras iela 18*, а яе кіраўніком прызначаны быў Павел Пырсікаў. У красавіку 1930 г. таварыства "Беларуская хата" звярнулася ў БША з просьбай прызначыць настаўніка. Аднак, згодна з заканадаўствам, таварыства мусіла самастойна забяспечыць яго ўтрыманне[13]. 12 жніўня 1930 г. быў зацверджаны статут установы. Выхавацелькамі сталі настаўніцы беларускай пачатковай школы ў Даўгаўпілсе Марыя Каспяровіч і Марыя Фёдарава. Пазней выхавацелямі былі Пелагея Квачова і П. Пырсікаў. На пачатку 1930-х гг. садок наведвала 25–30 дзетак. У 1931 г. таварыства "Беларуская хата" спрабавала ператварыць садок у пачатковую школу, але праз адсутнасць сродкаў задуму ажыццявіць не ўдалося. Установа не мела сталага бюджэту і ўтрымлівалася на ахвяраванні і складкі. З прычыны незаможнасці бацькоў матэрыяльнае становішча садка пагаршалася. У выніку адна з выхавацелек П. Квачова адмовілася ад пасады. У кастрычніку 1931 г. таварыства "Беларуская хата" безвынікова прасіла Беларускі школьны аддзел выдаткаваць 240 латаў на аплату арэнды будынка, бо ў адваротным выпадку садок мусіў яго пакінуць[14].

У кастрычніку 1931 г. у садок запісаліся 55 дзетак, з якіх 10 не наведвала яго, бо не мелі цёплай вопраткі. Паводле веравызнання сярод дзяцей было 20 каталікоў, 13 праваслаўных і 12 стараверaў[15]. У наступным месяцы

---

[10] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 94, л. 5.

[11] LVVA, 2125 f., 1 ap., 83 l., 21 lp.

[12] LVVA, 2125 f., 5 ap., 86 l., 37, 40 lpp.

[13] LVVA, 2125 f., 5 apr., 258 l., 28 lp.

[14] LVVA, 2125 f., 5 apr., 258 l., 57, 58 lpp.

[15] LVVA, 2125 f., 5 ap., 258 l., 64 lp.

колькасць дзетак у садку скарацілася да 32 (13 каталікоў, 11 праваслаўных, 8 стараверaў). Усе дзеткі былі беларусамі паводле нацыянальнасці[16]. У жніўні 1932 г., падчас нарады даўгаўпілскіх беларускіх арганізацый, абмяркоўвалася пытанне далейшага лёсу садка. Было вырашана не ліквідоўваць установу, але ў сувязі з матэрыяльнымі цяжкасцямі перанесці яе ў іншы раён горада – на Новае Будаўніцтва. У новым месцы, на вуліцы Гарадзенскай (*Grodņas iela*), *86* садок знаходзіўся ў невялікім драўляным будынку. У сувязі з гаротным матэрыяльным становішчам, кіраўніцтва таварыства "Беларуская хата" выдала адозву да беларускай грамадскасці з заклікам дасылаць ахвяраванні на ўтрыманне садка[17]. З цягам часу колькасць яго выхаванцаў не зменшылася. Па стане на 23 кастрычніка 1932 г. там было 45 дзетак у веку 4–9 год[18].

У ліпені 1933 г. кіраўніцтва Даўгаўпілскага аддзела таварыства "Беларуская хата" наступным чынам характарызавала стан садка: "*Як ужо адзначалася раней, дзіцячы сад у Дзвінску з'яўляецца неабходным дзеля папаўнення вучняў дзеля беларускае пачатковае школы ў Дзвінску, а па-другое з'яўляецца трэцяй асобнай установай у Дзвінску. Пры чым у мінулым годзе ў дзіцячым садзе абучалася 25 вучняў беларусаў, нягледзячы на невялікі лік вучняў у садзе, матэрыяльны стан сада быў у мінулым годзе вельмі цяжкі, так, выхавацелю сада плаціл 10 латаў у месяц, пры такой аплаце пенсіі вучыцель не можа існаваць, цёплых палудняў дзецям не выдавалася, а таксама ніякіх дапамог, далей такое палажэнне сада немажліва і таму праўленне т-ва 'Беларуская хата' звяртаецца да Рады аддзела і гр. Кіраўніка з просьбай дапамагчы ў асігнаванні 480 латаў, з якіх 360 на аплату выхавацелю і 120 латаў на ежу дзеля вучняў, а 650 латаў т-ва ў наступным навучальным годзе думае раздабыць ладжаннем вечарын і ахвярамі вучыцялёў Дзвінска*"[19]. Нягледзячы на кепскі матэрыяльны стан, садок праіснаваў да 1934 г., дзякуючы падтрымцы БША[20]. 5 лістапада 1933 г. на пасяджэнні Рады беларускіх арганізацый Даўгаўпілса было прынята рашэнне адкрыць новы беларускі дзіцячы садок у будынку на вуліцы Вальмарскай 18/1, у які планавалася прыняць 25 дзетак. Утрыманне садка ўзяло на сябе таварыства "Беларуская хата", а кантроль і арганізацыю навучальнай часткі – Даўгаўпілскі аддзел Таварыства беларускіх настаўнікаў Латвіі[21]. Лёс дадзенай ініцыятывы застаецца невядомы.

---

[16] LVVA, 2125 f., 5 apr., 330 l., 112 lp.

[17] *Хроніка,* "Думка беларуса" 1931, № 2, с. 4; К. Езавітаў, *Беларускія школы ў Латвіі ў 1933–34 навуч. годзе*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 7(24), с. 364; П. Пырсікаў, Ул. Ціхаміраў, *Адозва да беларускіх арганізацый і ўсяго беларускага грамадзства*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 5(22).

[18] LVVA, 2125 f., 5 apr., 258 l., 62 lp.

[19] LVVA, 2125 f., 5 ap., 258 l., lp. 72.

[20] LVVA, 2125 f., 5 ap., 259 l., 71 lp.

[21] LVVA, 2125 f., 5 ap., 258 l., 77 lp.

На пачатку 1930-х гг. таварыства актывізавала працу сярод сталічнай моладзі. У гэты час, дзякуючы намаганням таварыства, на Маскоўскім Фарштаце быў арганізаваны духавы аркестр. Акрамя таго, сталічныя аддзелы заапекаваліся адной са школ і ўтрымлівалі інтэрнат для вучняў. Плён працы таварыства на карысць адукацыі будзе падрабязна разгледжана пазней[22]. 13 снежня 1931 г. у Рызе адбылася канферэнцыя сяброў таварыства "Беларуская хата", на якім абмяркоўваліся пытанні беларускай прэсы ў Латвіі, беларускага народнага дома ў Латвіі, арганізацыі беларускага музея ў Латвіі, а таксама экскурсій настаўнікаў у Чэхаславакію, Літву і Заходнюю Беларусь[23]. У кастрычніку і лістападзе 1932 г. у Рызе і Даўгаўпілсе таварыства зладзіла ўрачыстыя святкаванні 50-годдзя Якуба Коласа і Янкі Купалы. У сталіцы мерапрыемства адбылося 30 кастрычніка 1932 г., у зале Рускага клуба. Выручка з вечарыны пайшла на патрэбы Рыжскай беларускай дадатковай асноўнай школы для дарослых[24].

Аднак паступова актыўнасць таварыства "Беларуская хата" пачала запавольвацца. Арганізацыя шторaз мацней адчувала адсутнасць грошай, кіраўніцтва было вымушана пакінуць арандаванае раней памяшканне на Саркандаўгаве. Да заняпаду спрычыніліся сваркі паміж актывістамі, якія падзяліліся на прыхільнікаў М. Дзямідава і К. Езавітава. Першы ў 1934 г. страціў пасаду старшыні, пасля чаго другі стаў фактычным кіраўніком арганізацыі. 8 сакавіка 1934 г. управа таварыства прыняла ўхвалу, у адпаведнасці з якой былога старшыню М. Дзямідава, а таксама сяброў С. Сіцьку і А. Родзьку прызнавалі вінаватымі ў растраце грошай арганізацыі. Было вырашана запатрабаваць ад іх вяртання грошай, а ў выпадку адмовы – скіраваць справу ў суд[25]. У траўні 1934 г. дамова арэнды памяшкання была адноўлена, дзякуючы намаганням прыхільнікаў К. Езавітава, якія ачолілі ўправу таварыства, адхіляючы ад кіраўніцтва М. Дзямідава[26].

Пасля беларускага судовага працэсу працягвала дзейнасць **Беларускае культурна-асветнае таварыства "Рунь"**, стрыжань якога складалі рыжскія беларусы. Заслугоўвае ўвагі, што сярод сяброў арганізацыі працяглы час не было К. Езавітава, што можна лічыць вынікам непрыязі паміж беларускімі актывістамі[27]. 16 траўня 1925 г. управа нарэшце прыняла рашэнне запрасіць

---

[22] LVVA, 2125 f., 5 apr., 11 l., 253 lp.

[23] LVVA, 2750 f., 1 apr., 7 l., 43 lp.

[24] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1006 l., 22 lp.; *У Латвіі*, "Родны край" № 1 ад 1 студзеня 1933 г., с. 7.

[25] LVVA, 2750 f., 1 apr., 6 l., 50 lp.

[26] Э. Екабосонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [в:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 66–67; LVVA, 3235 f., 5 apr., 1617 l., 11 lp.

[27] 12 красавіка 1925 г. К. Езавітаў у лісце Я. Шчорсу падзяліўся ўражаннем, што "Рунь нібыта не хоча мяне ў сабе бачыць". Аўтар лічыў, што асабліва стаўленне да яго пагоршылася падчас

у таварыства К. Езавітава, паколькі ён меў значны досвед культурна-асветнай працы. Раней, 12 красавіка 1925 г., управа задаволіла просьбу гэтага дзеяча дапамагчы ў продажы зборніка вучнёўскіх твораў "Ластаўка"[28]. Аднак далейшае супрацоўніцтва К. Езавітава з таварыствам не склалася[29].

Захавалася няшмат звестак наконт колькаснага складу арганізацыі. Верагодна, што сяброў было няшмат. 10 студзеня 1926 г. кіраўніцтва не здолела склікаць агульны сход, паколькі "па выпадку марозу і буры некаторыя члены Т-ва не маглі прыйсці"[30].

Крыніцай утрымання арганізацыі былі сяброўскія складкі, выручка ад арэнды памяшкання, а таксама прыбытак ад вечарын[31]. З мэтай больш паспяховай нацыянальна-культурнай працы сярод латвійскіх беларусаў, кіраўніцтва таварыства "Рунь" вырашыла ўвайсці ў шчыльны кантакт з таварыствам "Беларуская хата"[32]. 18 чэрвеня 1925 г. управа прыняла рашэнне адкрыць пры таварыстве сельскагаспадарчае бюро, у адказ на патрэбы беларускага сялянства[33]. Спачатку, аднак, дзейнасць арганізацыі абмяжоўвалася ладжаннем імпрэз і вечарын у Рызе, падчас якіх ставіліся п'есы *Модны шляхцюк*, *Конскі партрэт*, *Стараста*, *У кавалёвай хаце*, *Пасланец*, *Страхі жыцця* і інш. Паводле слоў кіраўнікоў таварыства, мэтай гэтых імпрэз было "*асаблівасцямі роднае мовы, матывамі песні, абразамі з жыцця родных і блізкіх закрануць душу рыжскага беларуса, напомніць яму аб яго далёкіх крэўных, абудзіць у ім свядомасць свае нацыянальнасці і падагрэць каханне да яе*"[34]. У 1924–1925 г. адбылося 17 вечарын. Рабіліся таксама спробы стварыць хор, але праз адсутнасць адпаведных талентаў задума

знаходжання ў турме. Аднак ён лічыў, што таварыства "Бацькаўшчына" ўжо не рэанімаваць, таму варта накіраваць высілкі на працу новай арганізацыі. LVVA, 1826 f., 1 ap., 1004 l., 223 lp.

[28] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1007 l., 39 lp. 2 красавіка 1925 г. К. Езавітаў пісаў кіраўніцтву таварыства "Рунь", што ў тыпаграфіі заляжаўся зборнік вучнёўскіх вершаў "Ластаўка". Ён скардзіўся, што падчас яго знаходжання ў вязніцы яго намеснік не парупіўся пра распаўсюд выдання. Таму ён прасіў кіраўніцтва таварыства "Рунь" закупіць выданне і складаць ахвяры на наступныя выданні "Ластаўкі", каб заплаціць тыпаграфіі за друк. LVVA, 1826 f., 1 ap., 1005 l., 88 lp.

[29] Пасля ўступлення ў таварыства "Рунь" К. Езавітаў заплаціў 500 рублёў уступнай складкі. Аднак не атрымаў адказу, а таксама не быў запрошаны на агульны сход сяброў 16 траўня 1925 г. У сувязі з гэтым 25 жніўня 1926 г. ён накіраваў ліст у праўленне таварыства з інфармацыяй, што, "*бачачы ў гэтым нежаданне некаторых сяброў Праўлення затрымаць магчымасць маёй працы ў т-ве 'Рунь'*", адклікае сваю згоду стаць сябрам арганізацыі і жадае, каб яго ўступная складка ў памеры 500 рублёў была пералічана Таварыству выбаршчыкаў-беларусаў як ахвяра на карысць гэтай арганізацыі. LVVA, 1826 f., 1 ap., 1004 l., 117 lp.

[30] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1007 l., 67 lp.

[31] LVVA, 2125 f., 5 ap., 11 l., 15 lp.

[32] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1007 l., 40 lp.

[33] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1007 l., 49 lp.

[34] LVVA, 2125 f., 5 ap., 11 l., 14 lp.

не ажыццявілася[35]. Пры таварыстве існаваў калектыў балалайшчыкаў, які выступаў на вечарынах. З сакавіка па травень 1925 г. з дазволу Міністэрства асветы таварыства "Рунь" зладзіла агульнаасветныя курсы для дарослых (на заняткі латышскай мовы запісалася 27 чал., музыкі – 14, спеву – 27). Дзякуючы курсам два беларусы вытрымалі іспыт па латышскай мове і тым самым здолелі захаваць працу на пошце[36]. Пры гэтым сярод удзельнікаў былі актывісты арганізацыі (С. Сіцько, Я. Шчорс), а таксама значны адсотак небеларусаў (латгальцаў, рускіх, палякаў). Выкладалі на гэтых курсах: беларус Я. Шчорс, латышы Метэрыс Стакс, Аляксандрс Кронбергс і рускі Фёдар Кальмакоў[37].

Наступны год існавання арганізацыі не даў такога плёну, як папярэдні. 20 лютага 1926 г. таварыства "Рунь" у сваёй рыжскай сядзібе абсталявала тэатральную сцэну і заснавала аматарскі тэатр, які, аднак, з-за адсутнасці сродкаў праз месяц спыніў існаванне[38]. У 1926 г. таварыства зладзіла толькі 4 вечарыны, на якіх былі пастаўленыя: камедыі *Пільнуй сваю хату*, *Я і мае жонкі маці*, *Модны шляхцюк*, *Жанчына, якую варта паважаць* (выступілі У. Гусарэвіч і Н. Пінская) і драма *Страхі жыцця* (гралі: П. Пінская, П. Масальскі, П. Вайноўскі і Л. Клагіш). Кіраўніцтва наступным чынам тлумачыла спад актыўнасці ў 1926 годзе: "*Напружаная праца першага 1925 г. малога ліку дзейных сяброў паказала, што пры значных прыбытках Т-ва і пры прыхільнасці да яго некаторых пастаронніх асоб, яно ў канечным рахунку працуе толькі на аплату памяшкання. Такія вынікі не маглі задаволіць Т-ва і яно з 7 сакавіка 1926 г. змушана было адмовіцца ад арэндуемага памяшкання і тым зняла з сябе абавязак штомесячнага выдатку*"[39].

Год 1926 быў пераломным у жыцці таварыства "Рунь", паколькі пагоршыўся фінансавы стан арганізацыі. У выніку таварыства пачало працаваць толькі на ўтрыманне памяшкання. 7 сакавіка 1926 г. кіраўніцтва было вымушана адмовіцца ад арэнднага памяшкання[40]. Да пагаршэння ўмоў культурна-асветнай працы таварыства спрычынілася з'яўленне ў горадзе саліднай канкурэнцыі. У горадзе пачалі працу шматлікія рускія таварыствы, якія рабілі тэатральныя мерапрыемствы. Акрамя таго, на інтэнсіўнасць працы таварыства ўплывала з'яўленне новых беларускіх агранізацый. Фінансы таварыства апынуліся ў крызісе, з'явіўся дэфіцыт у бюджэце. Гэта прымусіла "Рунь" абмежаваць арганізацыю імпрэз, якія не прыносілі

[35] LVVA, 2125 f., 5 ap., 66 l., 114 lp.
[36] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1004 l., 92 lp.
[37] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1005 l., 21–23, 27 lpp.
[38] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1004 l., 121 lp.
[39] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1004 l., 93 lp.
[40] LVVA, 2125 f., 5 ap., 11 l., 14 lp.

прыбытку[41]. У 1928 г. кіраўніцтва таварыства планавала засяродзіцца на акадэмічнай і выдавецкай дзейнасці, "*якая не дасць прыбыткаў грашовых, але магла б пакінуць след у сэнсе культурным*". У прыватнасці, планавалі рабіць пераклады з латышскай мовы і выдаваць метадычную і дзіцячую літаратуру на патрэбы беларускіх школ. Гэтыя планы не прынеслі вынікаў, бо таварыства не атрымала грашовай падтрымкі ад дзяржавы[42].

Больш выніковай была дзейнасць на карысць беларускай асветы. Нягледзячы на матэрыяльныя цяжкасці намаганнямі арганізацыі былі адчыненыя два дзіцячыя садкі – у Рызе і Лудзы[43]. Таварыства "курыравала" некаторыя школы, на што атрымлівала грошы з дзяржаўнага бюджэту. У 1928/29 гг. арганізацыя выдаткавала 850 латаў на дапамогу самым незаможным беларускім пачатковым школам. У лістападзе 1929 г. таварыства атрымала з дзяржаўнага бюджэту па 650 латаў на дапамогу беларускім школам Даўгаўпілшчыны і Лудзеншчыны [44].

30 красавіка 1931 г. было абрана новае кіраўніцтва ўправы ў наступным складзе: Люцыя Тэтар (старшыня), Дам'ян Чарнуха (намеснік старшыні)[45], Ніна Пінская (сакратар), Алесь Булат (скарбнік), Пятро Шпакоўскі (сябра), Баляслаў Блажэвіч (старшыня рэвізійнай камісіі), Яфім Апанасёнак (сябра рэвізійнай камісіі)[46].

Незалежна ад рыжскіх беларускіх актывістаў ініцыятывы па стварэнні культурна-асветных арганізацый праяўлялі іх калегі з Латгаліі. У 1925 г. сярод настаўнікаў Даўгаўпілскай беларускай гімназіі ўзнікла ініцыятыўная група па стварэнні **Беларускага культурна-асветнага таварыства "Крывіч".** Ажыццявіць гэту ідэю, аднак, не атрымалася, бо Латгальскі акруговы суд адмовіўся зацвердзіць статут новай арганізацыі[47].

Больш удалай ініцыятывай дзвінчукоў аказалася стварэнне **Беларускага культурна-асветнага аб'яднання "Прасвета"**. Сход ініцыятыўнай групы адбыўся 1 ліпеня 1926 г. у будынку Даўгаўпілскай беларускай гімназіі. Пад дакументам аб стварэнні новай арганізацыі падпісаліся Алесь Махноўскі, Феліцыян Астроўскі, Антаніна Якубецкая, Андрэй Якубецкі, Аўгуст Дварэцкі, Язэп Клагіш, Мікалай Талерка і інш. 27 ліпеня 1926 г. Латгальскі акруговы суд зацвердзіў статут арганізацыі, а 29 ліпеня адбыўся сход беларускіх дзеячаў, на якім была абрана ўправа ў наступным складзе: А. Махноўскі (старшыня),

---

[41] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1004 l., 93 lp.

[42] LVVA, 2125 f., 5 ap., 11 l., 14–15 lpp.; LVVA, 1826 f., 1 ap., 1004 l., 94 lp.

[43] LVVA, 2125 f., 5 ap., 11 l., 15 lp.

[44] LVVA, 2125 f., 5 ap., 401 l., 4, 32 lpp; LVVA, 2125 f., 5 ap., 399 l., 9 lp.

[45] Гэты чалавек з'яўляўся ўласнікам шапіка на цэнтральным рынку Рыгі.

[46] LVVA, 3235 f., 5 apr., 3082 l., 3 lp.

[47] *Беларускае жыцьцё*, "Голас беларуса" 1925, № 3 ад 1 ліпеня, с. 3; Тамсама, 1926, № 3 ад 20 красавіка, с. 3.

С. Сахараў (намеснік), Ф. Астроўскі (сакратар), А. Якубецкі (скарбнік), П. Жэрдзі[48]. Арганізацыя лічыла сябе спадкаемцай традыцый таварыства "Бацькаўшчына". Сядзіба таварыства знаходзілася ў Даўгаўпілсе, але ў навакольных вёсках ствараліся рэгіянальныя аддзелы. У 1927 г. у складзе арганізацыі налічваліся 142 сябры. Стрыжань таварыства складалі беларускія настаўнікі Даўгаўпілса і Даўгаўпілшчыны[49]. Стан захаваных крыніц не дазваляе ўзнавіць поўную сетку аддзелаў, але можна меркаваць, што яны ствараліся ў тых мясцовасцях, дзе існавалі беларускія школы. Захаваліся звесткі наконт персанальнага складу некаторых аддзелаў. 2 студзеня 1929 г. у вёсцы Вайцюлева адбыўся сход сяброў таварыства, на якім быў абраны склад управы: Парфіры Жэрдзі, Эдвард Вайводзіш, Вячаслаў Цішкевіч, Мікалай Талерка, Вільгельм Міраповіч[50]. 30 красавіка 1933 г. у 2-й Прыдруйскай школе адбыўся сход сяброў, на якім быў абраны новы склад управы: Якуб Кастылюк (старшыня), Парфіры Жэрдзі (намеснік старшыні), Мечыслаў Слосман (сакратар), Франц Оруб, Караль Казакевіч (скарбнік)[51].

Да восені 1926 г. таварыства "Прасвета" не атрымлівала дзяржаўнай дапамогі, асноўнай крыніцай прыбытку была выручка ад арганізацыі імпрэз і латарэй[52]. У снежні 1926 г. Культурны фонд адмовіўся падтрымаць грашыма стварэнне беларускай бібліятэкі ў Даўгаўпілсе, матывуючы гэта тым, што ў горадзе ўжо існуюць бібліятэкі[53]. Нягледзячы на нястачу сродкаў, арганізацыя ў 1927 г. спрычынілася да адкрыцця прыватнай беларускай школы для дарослых у Даўгаўпілсе, арганізацыі бібліятэкі, чытання лекцый для насельніцтва. У лістападзе 1928 г. арганізацыя звярнулася да інспектара беларускіх школ з просьбай дазволіць паказваць у некаторых школах фільмы *Жыццё французскага салдата на фронце*, *Патэра па спадчыне*, *Лоўля кракадзілаў*, *Чалавек з жалезнай маскай*, *Універсальны клей*, *Чорнае мора ў бурую ноч*[54]. Эфектыўнасць працы арганізацыі ўскладнялі ўнутраныя непаразуменні. У сакавіку 1929 г. падчас 4-й нарады прадстаўнікоў беларускіх арганізацый на таварыства "Прасвета" з боку некаторых беларускіх дзеячаў абрынулася хваля крытыкі. Закідалі, што кіраўніцтва не прымае ў свае шэрагі свядомых беларусаў, узурпавала ўладу, а сяброўскія складкі не плацяцца[55].

---

[48] *Беларускае жыцьцё ў Латвіі*, "Голас беларуса" 1926, № 17 ад 18 жніўня, с. 4.

[49] LVVA, 2125 f., 5 ap., 11 l., 18 lp.

[50] LVVA, 2125 f., 5 ap., 85 l., 14 lp.

[51] LVVA, 2125 f., 5 ap., 13 l., 50 lp.

[52] LVVA, 2125 f., 5 ap., 11 l., 18 lp.

[53] LVVA, 2067 f., 1 ap., 386 l., 21 lp.

[54] LVVA, 2125 f., 1 ap., 83 l., 2 lp.

[55] *4-я Уселатвійская нарада прадстаўнікоў усіх арганізацый беларускае меншасьці у Латвіі*, "Голас беларуса" 1929, № 1 ад 29 красавіка, с. 2.

Існаванне ў Латвіі беларускіх школ зрабіла магчымым узнікненне першай у краіне беларускай настаўніцкай арганізацыі. З ініцыятывы К. Езавітава 25 жніўня 1925 г. у Рызе адбыўся сход арганізацыйнай групы па яе стварэнні. Гэта былі: К. Езавітаў, М. Дзямідаў, Н. Пінская, Вольга Дзямідава, Аляксандр Найдзін, Ніна Фельдман. Прысутныя падпісалі статут. 2 верасня 1925 г. Рыжскі акруговы суд зарэгістраваў **Таварыства беларускіх настаўнікаў у Латвіі (ТБНЛ)** (у арыгінале: Таварыства беларускіх вучыцялёў у Латвіі – *Latvijas Baltkrievu Skolotāju Biedbrība*) (паводле іншых крыніц: *Baltkrievu skolotāju biedrība Latvijā*). Арганізацыя мела на мэце аб'яднанне беларускага настаўніцтва, дбанне аб паляпшэнні яго матэрыяльнага, культурнага і юрыдычнага становішча, працу з педагагічнымі і навуковымі пытаннямі, клопат пра развіццё беларускай школьнай справы, пашырэнне прафесійных і агульных ведаў сярод беларускай меншасці. Дзеля дасягнення гэтых мэтаў, арганізацыя магла ладзіць культурныя і асветныя мерапрыемствы: курсы, лекцыі, экскурсіі, чытанні. Таварыства магло ствараць касы ўзаемадапамогі, бюро па працаўладкаванні, арганізоўваць канцэрты, выставы і тэатральныя пастаноўкі, выдаваць літаратуру і прэсу. Арганізацыя магла ствараць дашкольныя пляцоўкі і навучальныя ўстановы. Згодна са статутам, ТБНЛ мела права ствараць камісіі і секцыі для распрацоўкі педагагічных культурна-асветных, гаспадарчых і школьна-адміністрацыйных праектаў. Таварыства магло зносіцца з беларускімі і іншымі таварыствамі і грамадскімі арганізацыямі ў межах Латвійскай Рэспублікі. Да арганізацыі маглі належыць не толькі настаўнікі, але ўсе, хто "*мог рабіць істотную дапамогу ў справе развіцця культурнага жыцця сярод беларускага жыхарства ў Латвіі*"[56]. Сябрам таварыства можна было стаць, атрымаўшы дзве рэкамендацыі. Крыніцай фінансавання ТБНЛ з'яўляліся сяброўскія складкі (уступны ўнёсак – 1 лат, штомесячны – 50 сантымаў альбо штогадовы – 6 латаў), прыбытак з мерапрыемстваў, добраахвотныя ахвяраванні, працэнты ад належнага таварыству капіталу. Найвышэйшым кіроўным органам лічыўся агульны сход, які склікаўся не радзей як раз на год. ТБНЛ з'яўлялася сябрам Латвійскага настаўніцкага хаўрусу. У сувязі з гэтым, сябры таварыства мелі абавязак штогод уносіць пэўную аплату ў касу гэтай арганізацыі[57].

Штодзённымі справамі арганізацыі кіравала ўправа з 5 асоб, якая абіралася на штогадовым з'ездзе сяброў. Першы склад часовай управы быў

---

[56] *Статут Т-ва беларускіх вучыцялёў у Латвіі* [у:] *Крывіцкія руны. Вып. II: Беларускі культурны мацярык у Латвіі*, рэд. М. Казлоўскі, С. Панізнік, Менск 2017, с. 375; *Статут Таварыства беларускіх вучыцялёў у Латвіі*, Рыга 1927, с. 9–10; НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 115, с. 1–8.

[57] *Статут Таварыства беларускіх вучыцялёў у Латвіі*, Рыга 1927, с. 11–29.

сфарміраваны 19 верасня 1925 г., падчас сходу ініцыятыўнай групы па стварэнні ТБНЛ. Яе склад быў наступны: К. Езавітаў (старшыня), Я. Шчорс (намеснік), Р. Плыгаўка (скарбнік), М. Клагіш (сакратар), М. Дзямідаў (сябра)[58]. 29–30 снежня 1925 г. у Рызе адбыўся першы агульны з'езд ТБНЛ, які абраў управу ў складзе: К. Езавітава (старшыня), Р. Плыгаўкі (намеснік старшыні), С. Сіцько (скарбнік), М. Краўчанкі (сакратар) і Г. Нікіфароўскай (сябра). У 1926 г. кіраўніцтва ТБНЛ складалася з К. Езавітава (старшыня), М. Дзямідава (сакратар), Н. Пінскай (сябра) і інш.[59] Архіўныя крыніцы дазваляюць прасачыць змены складу кіраўніцтва ў пазнейшы час. Напрыклад, 28 траўня 1933 г. быў абраны наступны склад управы: С. Сахараў (старшыня), К. Езавітаў (намеснік старшыні і скарбнік), Я. Клагіш (сакратар), Р. Плыгаўка і М. Дзямідаў (сябры)[60]. 8 чэрвеня 1933 г. кіраўніцтва было пашырана і складалася з наступных асоб: С. Сахарава (старшыня), К. Езавітава (скарбнік), Я. Клагіша (сакратар), Р. Плыгаўкі і М. Дзямідава (сябры), М. Слосмана, П. Мірановіча, У. Гусарэвіча (кандыдаты). У склад рэвізійнай камісіі ўвайшлі: К. Мяжэцкі (старшыня), Ф. Клагіш і Я. Кудраўцоў (сакратар), С. Сіцько і Я. Камаржынскі (кандыдаты)[61].

Сядзіба арганізацыі знаходзілася ў Рызе па адрасе: вуліца Альбяртоўская, 5/9 (*Alberta iela*), але пазней пераехала ў новае месца на вуліцу Меркеля, 3/5 (*Merķeļa iela*). Таварыства мела аддзелы, у якіх магло быць не менш як па 5 сяброў. Існавалі два аддзелы: у Рызе, Даўгаўпілсе (С. Сахараў – старшыня, Я. Кастылюк – скарбнік, П. Масальскі – сакратар) і Лудзы (С. Казека – старшыня, С. Маціеўскі – скарбнік, Васіль Лазаронак – сакратар)[62]. Стварэнне Даўгаўпілскага аддзела адбылося з пэўнымі цяжкасцямі, паколькі Латгальскі акруговы суд толькі за трэцім разам зарэгістраваў яго статут[63].

Паводле К. Езавітава, арганізацыя павінна была згуртаваць вакол сябе ўсе беларускі сілы, якія працавалі дзеля асветна-культурнага ўздыму беларускай меншасці і пашырэння беларускай школьнай справы. Ён лічыў, што кожны настаўнік-беларус абавязаны быць сябрам арганізацыі і браць удзел у яе мерапрыемствах[64]. Невыпадкова, што дзеяч планаваў з цягам часу на базе ТБНЛ стварыць Таварыства беларусаў Латвіі[65].

---

[58] *Таварыства беларускіх вучыцялеу у Латвіі*, "Голас беларуса" 1925, № 14 ад 25 верасня, с. 4.

[59] LVVA, 2125 f., 5 ap., 80 l., 4 lp.

[60] *Сябром Таварыства Беларускіх вучыцялёў у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 4(21), с. 305.

[61] LVVA, 3235 f., 5 apr., 1619 l., 1 lp.

[62] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 100, л. 12.

[63] *Беларускае жыцьцё*, "Голас беларуса" 1925, № 3 ад 1 ліпеня, с. 3.

[64] *Статут Таварыства беларускіх вучыцялёў у Латвіі*, Рыга 1927, с. 5.

[65] *Крывіцкія руны. Вып. II: Беларускі культурны мацярык у Латвіі*, укл.: М. Казлоўскі, С. Панізнік, Менск 2017, с. 446, 447.

Заклік К. Езавітава толькі часткова знайшоў водгук сярод беларускага настаўніцтва. Вось якім чынам выглядала дынаміка росту колькасці сяброў таварыства. 1 верасня 1925 г. у склад арганізацыі было прынята 10 чал., 1 снежня 1925 г. – 19, 1 студзеня 1926 г. – 16, 1 кастрычніка 1926 г. – 2, 1 студзеня 1927 г. – 2, 1 сакавіка 1927 г. – 2. Напрыканцы 1927 г. у ТБВЛ уваходзіла 58 чал. Самым шматлікім з'яўляўся Рыжскі аддзел, які ў 1933 г. налічваў 37 чал.[66] Найбольш актыўнымі дзеячамі арганізацыі былі Віктар Вальтар, Язэп Камаржынскі, Аўгуст Дварэцкі, Міхась Краўчанка, а. Сава Трубіцын, кс. Язэп Гайлевіч, Уладзімір Ціхаміраў, Алесь Сальцэвіч, Галіна Нікіфароўская, Алесь Махноўскі, Сяргей Сахараў, Эдвард Вайводзіш, Ян Шчорс, Станіслаў Красневіч[67]. Аднак актыўнасць большасці настаўніцтва ў ТБНЛ не ўражвала. 27 снежня 1927 г. у Рызе адбыўся гадавы сход сяброў, на які прыбыло настолькі мала дэлегатаў, што некаторыя ўдзельнікі прапаноўвалі замест з'езда правесці нараду. На гэтым жа з'ездзе было адзначана, што таварыства, хоць і існуе ўжо два гады, усё яшчэ знаходзіцца ў стадыі арганізацыі праз нешматлікасць настаўнікаў, якія да яго далучыліся. Многія сябры таварыства не аплачвалі рэгулярна сяброўскіх складак. На сходзе было пастаўлена пытанне пра іх далейшае сяброўства[68].

Але ТБНЛ магло пахваліцца і пэўнымі поспехамі, асабліва на ніве апекі над школамі. Таварыства брала ўдзел у зборы сродкаў на школьныя прылады для незаможных вучняў, рабіла ўнёскі ў студэнцкі стыпендыяльны фонд, адчыніла дзве прыватныя школы, выдавала часопіс "Беларуская школа ў Латвіі". У другой палове 1920-х гг. кіраўніцтва таварыства планавала экскурсію беларускіх настаўнікаў у Польшчу і Чэхаславакію (па трасе: Даўгаўпілс – Вільня – Варшава – Вена – Прага)[69]. Арганізацыя займалася стварэннем дашкольных устаноў. Напрыклад, улетку 1928 г. таварыства зладзіла дзіцячую калонію на Даўгаўпілшчыне[70]. Намаганнямі аддзела ў Даўгаўпілсе быў створаны дзіцячы садок (кіраўнік Пелагея Юркевіч). Установа месцілася на вуліцы Зелткална, 9 (*Zeltkalna iela*)[71]. У 1933/34 гг. садок наведала 28 дзетак[72]. Таварыства ладзіла курсы латышскай мовы для настаўнікаў. Напрыклад, на курсы латышскай мовы ў Даўгаўпілсе ўлетку

---

[66] К. Езавітаў, *3-ці Надзвычайны Агульны Сход Таварыства Беларускіх вучыцялёў у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 1(18), с. 259–260.

[67] *Сход Цэнтральнага Прауленьня Т-ва беларускіх вуцяцялёў у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1927, № 5(3), с. 61.

[68] *Справаздача Цэнтральнага Прауленьня*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1928, № 8(1), с. 110–111.

[69] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1006 l., 31 lp.

[70] *Справаздача Цэнтральнага Прауленьня*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1928, № 8(1), с. 114.

[71] LVVA, 2125 f., 5 ap., 259 l., 68 lp.

[72] LVVA, 2125 f., 5 ap., 33 l., 3 lp.

1932 г. запісалася 22 чал. Лектарам быў настаўнік рускай гімназіі Яніс Баўэрс[73]. Курсы фінансаваў часткова БША, а часткова самі слухачы[74]. Менш актыўным быў аддзел у Лудзы, створаны 10 кастрычніка 1927 г.[75]

Таварыства цікавілася не толькі справамі школ і асветы, але таксама агульнанацыянальным жыццём. Кіраўніцтва Даўгаўпілскага аддзела ТБНЛ 6 красавіка 1929 г. на прапанову У. Гусарэвіча вырашыла напярэдадні перапісу насельніцтва Латвіі 1930 г. правесці шэраг культурна-асветных мерапрыемстваў у Латгаліі. У прыватнасці, планавалася зладзіць у Лудзы ўлетку 1929 г. 3-тыднёвыя курсы беларусазнаўства з лекцый па гісторыі беларускай літаратуры, гісторыі і этнаграфіі Беларусі. Была ўхваленая прапанова запрасіць лектараў з Вільні (Антона Луцкевіча, Ігната Дварчаніна) і Менску (Усевалада Ігнатоўскага, Уладзіміра Пічэту, Мікалая Каспяровіча). Арганізатары лічылі, што мерапрыемства патрэбна для "*падняцця нацыянальнага настрою як вучыцельства, так і беларускай моладзі, але таксама ў мэтах падняцця агульнай веды па беларусазнаўстве*"[76]. 30 верасня 1933 г. адбыўся сход сяброў ТБНЛ, на якім быў разгледжаны праект новага закона "Аб асвеце". У абмеркаванні ўзялі ўдзел прадстаўнікі Уселатвійскага настаўніцкага хаўрусу. Было вырашана падтрымаць пратэсты настаўнікаў-латышоў і патрабаваць, каб улады лічыліся з інтарэсамі беларускай меншасці[77].

Матэрыяльнае становішча ТБНЛ было складаным з прычыны значных выдаткаў і ўхілення часткі сяброў ад аплат складак. Атрыманыя складкі часткова накіроўваліся ў касу цэнтральнай управы (50%), а часткова (50%) заставалася ў касе мясцовых аддзелаў. Іншай крыніцай фінансавання была выручка з мерапрыемстваў, якія ладзіла таварыства (латарэі, дабрачынныя вечарыны)[78]. Бюджэт цэнтральнай управы арганізацыі за 1925 г. склаў 82,90 латы, за 1926 г. – 28,79, за 1927 г. – 1 393,03. Большая частка гэтай сумы – сяброўскія складкі і ахвяраванні (707,80), а таксама дзяржаўная дапамога (310,94). Грошы ў асноўным ішлі на ўтрыманне прыватных школ: Шылаўскай (573,40) і Рыжскай дадатковай (693,20)[79]. З аналізу планаванага бюджэту на 1928 г. вынікае, што складкі, аднаразовыя ўнёскі, выручка з продажу часопіса

---

[73] *Хроніка беларускага жыцьця ў Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, 1(11), с. 160; LVVA, 2125 f., 5 ap., 361 l., 4, 31, 34 lpp.

[74] Курсант, *Курсы латыскае мовы для беларускіх вучыцялеу*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 3(13), с. 193.

[75] *Справаздача Цэнтральнага Прауленьня*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1928, № 8(1), с. 115.

[76] LVVA, 2125 f., 5 ap., 80 l., 18 lp.

[77] *З жыцьця Т-ва Беларускіх вучыцялёў у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 6(23), с. 343.

[78] *Сход Цэнтральнага Прауленьня Т-ва беларускіх вуцяцялёў у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1927, № 5(3), с. 61.

[79] *Грашовы стан Т-ва беларускіх вучыцялёў*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1928, № 8(1), с. 113.

“Беларуская школа ў Латвіі” давалі арганізацыі нязначны прыбытак. Асноўнай крыніцай утрымання з’яўлялася дзяржаўная дапамога па лініі Міністэрства асветы і рыжскага гарадскога самакіравання[80]. 10 красавіка 1928 г. К. Езавітаў звярнуўся ў Беларускі школьны аддзел з просьбай падтрымаць фінансава ТБНЛ як арганізацыю, якая шмат робіць на нацыянальна-культурнай ніве[81]. 28 красавіка 1928 г. ён прасіў выдаткаваць 1 тыс. латаў на наступныя мэты: утрыманне прыватных школ, пераплёт кніг у даўгаўпілскай бібліятэцы, утрыманне лудзенскай бібліятэкі, падтрымку (200 латаў) часопіса “Беларуская школа ў Латвіі”[82]. Улетку 1928 г. дзяржаўныя кантралёры сцвердзілі, што сродкі, якія ТБНЛ атрымала з дзяржаўнага бюджэту, не былі выкарыстаны ў адпаведнасці з прызначэннем, паколькі арганізацыя мае характар школьны, а не культурна-асветны[83].

Праз хранічную нястачу сродкаў кіраўніцтва мусіла шукаць дадатковыя крыніцы фінансавання. Сведчыць пра гэта ліст (5 траўня 1932 г.) старшыні ўправы Р. Плыгаўкі кіраўніку Рыжскай беларускай прыватнай гімназіі: “*Праўленне Т-ва Беларускіх Вучыцялёў у Латвіі ў сваім пасяджэнні 3 траўня 1932 г. пастанавіла прасіць персанал Рыжскай прыватнай беларускай гімназіі згадзіцца на адлічэнне ад сваёй пенсіі, атрымліванай праз Праўленне хаўрусу, 1% на карысць Т-ва. Мы былі змушаны звярнуцца да кіраўніцтва гімназіі з гэткай просьбай таму, што ў Праўлення няма ніякіх сродкаў нават на самыя дробныя выдаткі, як, напрыклад, на паперу для канцылярыі і на паштовыя выдаткі. Сучаснае Праўленне не атрымала ад старога Праўлення ніводнага сантыма, а сяброўскіх складак за час 1 студня 1932 г. атрымала толькі 3 л. 50 сант.*”[84].

З часам фінансавая сітуацыя арганізацыі зрабілася настолькі цяжкай, што ТБНЛ мела запазычанасці перад Уселатвійскім настаўніцкім хаўрусам. Становішча ўскладняў факт, што многія сябры таварыства па-ранейшаму не плацілі складак. 26 студзеня 1933 г. удзельнікі 3-га надзвычайнага

---

[80] LVVA, 2125 f., 5 ap., 11 l., 1 lp.

[81] У лісце К. Езавітава чытаем: “*Перасылаючы пры гэтым у мэтах інфармацыі бюджэты Таварыства Беларускіх Вучыцялёў за 1925, 1926 і 1927 годы, Цэнтральнае Праўленне звяртае ўвагу Беларускага Аддзела на тую значную культурна-асветную працу, якая прарабляецца сіламі Таварыства, і просіць падтрымаць Таварыства ў яго пачынаннях шляхам асігнавання Таварыству належных дапамог са сродкаў Беларускага Аддзела. Таварыства, ведаючы малыя магчымасці беларускага бюджэту, не адважваецца вызначыць пэўную суму тае дапамогі, на якую яно разлічвае, але просіць Вас і Раду Беларускага Аддзела пры падзеле сродкаў, мець на ўвазе як агульны абарот Т-ва гэтак і спецыфічна школьныя пачынанні яго*”. LVVA, f. 2125, apr. 5, 11 l., 6 lp.

[82] LVVA, 2125 f., 5 ap., 11 l., 6, 16 lpp.

[83] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 68 lp.

[84] LVVA, 3175 f., 1 ap., 9 l., 89 lp.

агульнага схода ТБНЛ пастанавілі выключыць з таварыства тых, хто не заплаціў складкі за мінулыя гады. Акрамя таго, вырашылі вызначыць месячныя складкі ў памеры 50 сантымаў, а ў будучыні адлічваць іх у выглядзе 1% штомесячнага заробку[85]. Ёсць падставы меркаваць, што гэты крок не палепшыў сітуацыі, паколькі на агульным сходзе ТБНЛ 28 траўня 1933 г. было вырашана пазбавіць сяброўства тых, хто меў запазычанасці[86].

Таварыства падтрымлівала сувязь з настаўніцкімі арганізацыямі за межамі Латвіі. У 1931 г. у кангрэсе настаўнікаў Балтыі ў Коўне ўдзельнічалі прадстаўнікі ТБНЛ (К. Езавітаў, М. Дзямідаў, С. Сіцько)[87]. Улетку 1933 г. у Таліне адбылася настаўніцкая канферэнцыя краін Балтыі, у якой узяла ўдзел беларуская дэлегацыя (К. Езавітаў, Г. Нікіфароўская)[88].

На пачатку 1930-х гг. была зроблена спроба стварыць яшчэ адну беларускую настаўніцкую арганізацыю. 22 студзеня 1933 г. у Рызе на прапанову К. Езавітава адбыўся сход ініцыятыўнае групы (14 чал.) па заснаванні **Працоўнага аб'яднання беларускіх настаўнікаў – выкладчыкаў беларускай мовы**. У склад новай арганізацыі павінны былі ўвайсці К. Езавітаў, П. Мірановіч, С. Сіцько, М. Калінін, Я. Клагіш, Г. Нікіфароўская, Я. Кудраўцоў і інш.[89] Мяркуючы, аднак, па тым, што гэта адзіная ўзгадка пра арганізацыю, праца па яе стварэнні не выйшла па-за праектныя рамкі.

Кааператыўная дзейнасць

Беларускаму нацыянальнаму актыву былі добра знаёмыя матэрыяльныя цяжкасці, з якімі змагалася латгальская вёска. І нацыянальныя дзеячы спрабавалі палепшыць умовы жыцця і працы суайчыннікаў. Галоўнымі лекамі ад галечы і нястачы сялянства прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі лічылі самаарганізацыю сялян-беларусаў у кааператыўных таварыствах. Ідэя кааперацыі не была вынаходніцтвам беларускага актыву. У Латвіі яшчэ з часоў, калі краіна з'яўлялася часткай Расійскай Імперыі, існаваў багаты досвед стварэння кааператыўнага руху. У міжваенны час ён яшчэ больш развіўся, паколькі аснову сельскай гаспадаркі складалі невялікія сялянскія

---

[85] Езавітаў, *3-ці Надзвычайны Агульны Сход Таварыства Беларускіх вучыцялёў у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 1(18), с. 260.

[86] *Сябром Таварыства Беларускіх вучыцялёў у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 4(21), с. 305.

[87] ГАРФ, ф. 5875, оп. 1, д. 11, л. 281.

[88] *У Латвіі,* "Родны край" № 19 ад 16 верасня 1933 г., с. 6.

[89] *Праца "Аб'яднаньня вучыцялёў беларускае мовы" у 1932–33 навуч. годзе*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 3(20), с. 293; *Закладзіны новага Беларускага Пэдагогічнага Аб'яднаньня*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 1(18), с. 273.

гаспадаркі, які не былі ў стане паасобку канкураваць на рынку. Яны ядналіся ў кааператыўныя таварыствы, якія ў хуткі часе ператварыліся ў вядучую сілу мясцовай сельскай гаспадаркі. Кааператыўныя арганізацыі ахоплівалі амаль усе аспекты жыцця вёскі. Дзякуючы сетцы кааператываў, сяляне маглі падтрымліваць адзін аднаго праз арганізацыю агульных закупаў прадукцыі. Кааперацыя выконвала яшчэ адну істотную функцыю на вёсцы: спрыяла павышэнню сельскагаспадарчай культуры – ладзіліся адпаведныя курсы і лекцыі з удзелам спецыялістаў. У 1920-я гг. у Латвіі дзейнічала каля 2 700 розных кааператыўных таварыстваў, з якіх ажно каля 2 500 знаходзілася на вёсцы. Да кааператыўнага руху належала не менш як 260 тыс. чал. У сярэднім на тэрыторыі аднаго павета існавала каля 130 кааперацый, у тым ліку 15 сельскагаспадарча-спажывецкіх, 20 крэдытных, 24 малочныя, 20 страхавых, 8 тэхнічных і г.д. Сродкі, якімі валодалі сельскія кааператывы, складалі 70% агульнага грамадскага капіталу Латвіі. Кааператывы ўваходзілі ў склад Рады латвійскіх кааператыўных кангрэсаў, якая прадстаўляла кааператараў у зносінах з іншымі ўстановамі і арганізацыямі. Адначасова існавала Латвійскае цэнтральнае сельскагаспадарчае таварыства, якое яднала звыш 400 правінцыйных сельскагаспадарчых таварыстваў. Гэта арганізацыя займалася, напрыклад, даследаваннямі ў галіне штучных угнаенняў, а таксама ладзіла курсы па ўдасканаленні гаспадаркі[90].

Сетка кааператываў не выглядала паўсюль аднолькава, а яе гушчыня залежала ад рэгіёну. Абсалютным лідарам у кааператыўным руху з'яўлялася "балтыйская" Латвія з яе высокім эканамічным узроўнем. Тым часам Латгалія як найменш заможны рэгіён Латвіі быў на супрацьлеглым полюсе кааператыўнага руху. Тым не менш, тут таксама ствараліся кааператыўныя таварыствы. Кааператыўныя аб'яднанні ўзнікалі як паводле тэрытарыяльнай (напрыклад: Земгальскае і Курляндскае сельскагаспадарчыя таварыствы), так і нацыянальнай прыкметы. У апошнім выпадку кааператыўны рух выконваў не толькі эканамічныя функцыі, але і мусіў спрыяць кансалідацыі нацыянальнай меншасці. Добрым прыкладам з'яўлялася Польскае сельскагаспадарчае таварыства ў Даўгаўпілсе[91]. У шэрагах гэтай арганізацыі ў 1931 г. налічваліся 93 сябры, у 1935 г. – 387, у 1936 г. – 484[92].

Такім чынам латвійскія беларусы бачылі прыклад, як можна самаарганізавацца дзеля паляпшэння дабрабыту сваёй вёскі. Беларускія дзеячы небеспадстаўна лічылі, што кааперацыя станоўча паўплывае на агульны стан беларускага нацыянальнага руху ў Латвіі, паколькі адным з галоўных яго

---

[90] T. Zakrzewski, *Jak pracują spółdzielnie rolnicze na Łotwie*, Warszawa 1929, s. 25–59.

[91] LCVA, f. 156, ap. 1, b. 69, List zarządu Polskiego Towarzystwa Rolniczego w Dyneburgu do PUPP w Wilnie, XII 1930.

[92] AAN, MSZ, t. 10475, Szkolnictwo polskie na Łotwie, 1938, k. 16.

клопатаў была нястача грошай. Незаможнае беларускае сялянства не было ў стане падтрымліваць свае культурна-асветныя арганізацыі, што рабіла іх залежнымі ад дзяржаўных датацый. Беларускі актыў заклікаў беларускае латгальскае сялянства браць прыклад з прадстаўнікоў іншых нацыянальных груп, перадусім латышоў[93]. Адным з прыхільнікаў беларускай кааперацыі з'яўляўся К. Езавітаў. Ён дакараў беларускіх сялян за эканамічную пасіўнасць, якую лічыў адной з прычын галечы. Выйсце з сітуацыі дзеяч бачыў у стварэнні сеткі беларускіх сельскагаспадарчых таварыстваў і працоўных арцеляў[94]. На старонках газеты "Голас беларуса" К. Езавітаў рыхтаваў асобны раздзел, у якім публікаваліся *Популярныя вочаркі па тэорыі кааперацыі*. Дзеяч лічыў, што дапамагчы сялянам у стварэнні кааператыўных суполак павінна беларускае настаўніцтва. З гэтай мэтай на старонках выдання "Беларуская школа ў Латвіі" ён знаёміў настаўнікаў з прынцыпамі кааператыўнай працы. У прыватнасці, там была надрукавана ў перакладзе на беларускую мову праца К. Пажытнова *Што такое праўдзівы кааператыў?*

Не толькі К. Езавітаў выказваў заклапочанасць сітуацыяй з беларускімі кааператывамі ў Латвіі. Гэтым займаліся і іншыя беларускія актывісты.

---

[93] На старонках прэсы беларускі актыў наступным чынам заахвочваў сялян да гаспадарчай актыўнасці: "*Трэба ўжо раз назаўсёды зразумець, што на вёсцы нам даўно ўжо зрабілася цесна. Тыя, хто можа астацца на зямлі і мае на вёсках зямлю, павінны пабіцца на хутары або зарганізавацца ў пасёлкі, і заняцца падоймам і паляпшэннем сваёй гаспадаркі: пераходзіць на многаполле, заводзіць сельскагаспадарчыя машыны, заводзіць малочную гаспадарку, кураводства, жывёлагадоўлю. На адным лёне ды жыце – цяперака – не ўтрымацца ды і гадоўля свіней, напрыклад, куды выгадней, чым продаж жыта. Тыя, каму зямлі на вёсцы няма, – павінны заняцца іншым справамі. Частка павінна ўзяцца за абслугоўванне вёскі ў якасці рамеснікаў, дробных гандляроў, або кааператараў (...), але ўсе іншыя павінны выселіцца і знайсці сабе працу па гарадах Латвіі або, нават, эміграваць за мяжу, напрыклад, у Канаду. Зразумела, што рабіць усё гэта, – і паляпшаць гаспадарку, і дамагацца ссудаў, і атрымліваць крэдыты, і шукаці працыі і эміграваць, трэба зарганізавацца. Паасобным адзінкам, на свой страх і рыск, на свае ўласныя сілы дасягнуць гэтага не ўдасца. Тутака трэба, каб уся беларуская меншасць у Латвіі моцна згуртавалася*". К. Сянкевіч, *Беларуская сялянская гаспадарка перад крахам*, "Голас беларуса" 1926, № 18 ад 25 жніўня, с. 1.

[94] У рэфераце К. Езавітава прысвечанаму эканамічнай працы сярод беларускага сялянства чытаем: "*Нашая вёска таму такая бедная, што зусім не зарганізавана на экаманічным грунце. Яна не мае апарату для выгаднае прадажы сваіх вырабаў і для больш таннае закупкі вырабаў горада. Беларускі селянін усё прадае і купляе праз перакупшчыкаў, якія дзяруць з яго апошнюю кашулю. Трэба ўжыць усіх спосабаў,каб спыніць гэтае з'явішча. У беларускай вёсцы павінны з'явіцца беларускія сельска-гаспарадчыя т-вы, малачарні, сыраварні, кааператывы, пазычкова-ашчадныя касы, пракатныя пункты і інш. Беларускія рабочыя павінны згуртавацца ў свае арцелі (сяброўствы) і таварыствы, якія шукалі-б працы, заключалі кантракты і стархавалі-б і падтрымлівалі-б беспрацоўных. Стварэннем гэткіх таварыстваў павінны заняцца аддзелы Т-ва*". *2-гі Зьезд дэлегатаў "Т-ва беларусаў-выбаршчыкаў у Латвіі". Аб эканамічнай працы сярод беларускае меншасці ў Латвіі*, "Голас беларуса" 1926, № 41, с. 2.

Напрыклад, на старонках газеты "Гаспадар" чытаем: "*Возьмем-жа з іх прыклад, будзем вучыцца, каб прасвятліць свой розум, будзем меркаваць, каб менш траціць працы і больш мець карысці ад яе. Будземо напружанаю працаю дабываць сантымы, ашчадней траціць іх, збіраць на агульную закупку зямлі, скаціны, ці гаспадарчых рэчаў. Трудна, цяжка будзе напачатку, бо толькі мукамі дастаецца чалавеку ўсякі набытак, толькі натугаю, потам і крывавым мазалём палягчаецца гора беднага жыцця*"[95].

Першыя крокі па арганізацыі беларускіх таварыстваў эканамічнага профілю былі зроблены ў сярэдзіне 1920-х гг. На пасяджэнні прадстаўнікоў беларускіх арганізацый Даўгаўпілшчыны 12 жніўня 1926 г. была створана ініцыятыўная група (Я. Кастылюк, Ф. Астроўскі, А. Барткевіч, А. Шкульцін) па арганізацыі ў Даўгаўпілсе Беларускага пазыкова-ашчаднага таварыства[96]. 19 верасня 1926 г. у Даўгаўпілсе адбыўся чарговы сход ініцыятыўнай групы, на якім Я. Кастылюку было даручана апрацаваць статут арганізацыі і падаць яго для зацвярджэння ў Латгальскі акруговы суд[97]. Аднак толькі 1 лістапада 1926 г. у Рызе было створана **Беларускае цэнтральнае пазычкова-ашчаднае таварыства (БЦПАТ)** пад кіраўніцтвам Яна Тэтара. Ва ўправу арганізацыі ўвайшлі Я. Шчорс (намеснік старшыні), Пятро Стак (старшыня рады таварыства), Ян Каўлін (намеснік рады таварыства), С. Красневіч (сакратар рады таварыства), Р. Плыгаўка, уладальнік роварнай майстэрні "Цыклоп" Міхаіл Васілянін, уласнік крамы дроў Васіль Аксемаў, П. Мартысон і іншыя. Акрамя таго, да ліку актыўных дзеячаў таварыства належалі А. Сальцэвіч, А. Райко, А. Барткевіч і кс. Я. Гайлевіч[98]. Першапачаткова сядзіба таварыства знаходзілася на Марыінскай вуліцы 18 (*Marijas iela*), але потым пераехала ў новае месца па адрасе *Brivibas iela* 2[99]. У 1927 г. арганізацыя налічвала ўсяго 45 сяброў[100]. Арганізацыя была створана паводле прынцыпу адпаведных таварыстваў іншых народаў. БЦПАТ ставіла за мэту павышэнне сельскагаспадарчай асветы беларускага сялянства і стварэнне ўмоў для аб'яднання беларускіх гаспадароў у кааператывы. Кіраўніцтва арганізацыі выказала жаданне мець уласнага прадстаўніка ў Радзе БША[101].

---

[95] "Гаспадар" 1926, № 2, с. 2.

[96] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 93, л. 8 зв.

[97] *Беларускае жыцьцё у Латвіі*, "Голас беларуса" 1926, № 21 ад 6 кастрычніка, с. 4.

[98] *Склад органаў праўленьня Беларускага Цэнтральнага Пазычкова-Зьберагацельнага Таварыства*, "Гаспадар" 1926, № 1, с. 7.

[99] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 93, л. 8 зв.

[100] Э. Екабосонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [в:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 69.

[101] LVVA, 2125 f., 5 apr., 75 l., 106 lp.

На пачатку 1927 г. Латгальскі акруговы суд зацвердзіў статут арганізацыі. Беларуская прэса паведамляла, што ўвесну 1927 г. назбіралася ўжо каля 20 сяброў, якія былі гатовыя ўнесці па 1000 латаў на карысць арганізацыі, але далейшае развіццё кааперацыі адбывалася павольна[102]. Таварыства выдавала ўласную газету "Гаспадар", на старонках якой даваліся практычныя парады сялянам: напрыклад, як правільна выкарыстоўваць угнаенні, каб глеба лепш радзіла, як адчыніць краму і г.д.[103]

Арганізацыя падтрымлівала кантакты з іншымі беларускімі грамадскімі таварыствамі. Напрыклад, 5 лістапада 1926 г. управа таварыства "Рунь" прыняла рашэнне ўвайсці ў зносіны з БЦПАТ і аддаць яму на захаванне свае грошы[104]. На жаль, не захавалася шмат звестак пра дзейнасць таварыства, што можа сведчыць пра нязначную актыўнасць яе сяброў. Вядома, аднак, што БЦПАТ праіснавала да пачатку 1930-х гг.[105]

Пра паляпшэнне эканамічнай сітуацыі латвійскіх беларусаў дбаў таксама Беларускі школьны аддзел. 17 ліпеня 1927 г. яго Рада вырашыла звярнуць больш пільную ўвагу на працу скіраваную на гаспадарчую актыўнасць сялян, прафесійную адукацыю ў вёсках і развіццё сельскагаспадарчага профілю ў беларускіх пачатковых школах[106]. У 1927 г. з ініцыятывы кіраўніка БША пачаў працу **Беларускі асветны кааператыў "Культура і праца"**. Яго мэтай было паляпшэнне матэрыяльнага і культурнага стану беларускай меншасці. Арганізацыя налічвала ў сваіх шэрагах усяго 11 сяброў, а на чале знаходзіўся У. Пігулеўскі. У кіраўніцтва ўваходзіў М. Краўчанка. Асноўная дзейнасць кааператыва палягала ў забеспячэнні беларускіх школ кніжнай прадукцыяй. Разам з БЦПАТ ён займаўся зборам кніг для беларускіх школ[107]. Выдавецкая прадукцыя пераважна паходзіла з Польшчы і БССР. Плёнам дзейнасці кааператыва належыць таксама лічыць выданне беларускага календара на 1928 г.– першага беларускага выдання такога кшталту ў Латвіі. Рэдкалегія календара складалася з У. Пігулеўскага, К. Езавітава і Н. Пінскай. У 1928 г. кіраўнік кааператыва ўзяў удзел ва Уселатвійскім кангрэсе

---

[102] *Беларускае жыцьцё у Латвіі*, "Голас беларуса" 1927, № 9 ад 25 траўня, с. 4.

[103] *Прычыны заняпаду беларуакай гаспадаркі*, "Гаспадар" 1926, № 3, с. 8–9; *Як наладзіць спажывецкую краму*, Тамсама, с. 18–22.

[104] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1007 l., 63 lp.

[105] *Сход Дзьвінскага кааператыўна-страхоўчага т-ва*, "Наша доля" 1930. № 2 ад 7 лютага, с. 4.

[106] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 42 lp.

[107] Н. Голубева, *Беларусы ў Латвіі* [у:] *Беларускае замежжа*, рэд. Н. Голубева, Менск 2010, с. 196; Н. Слука, *Часопісы беларускай эміграцыі ў Латвіі ў міжваенны перыяд (на аснове фондаў аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі)* [у:] *Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі*, Менск 2013, с. 190.

кааператываў[108]. Мяркуючы па захаваных крыніцах, шырэйшай дзейнасці кааператыў не здолеў разгарнуць. Цікавае сведчанне наконт спроб прыцягнення ў яго шэрагі новых асоб захаваліся на старонках прэсы. Адзін з жыхароў вёскі Гарбачоўцы (Індраўская воласць) пісаў: "*Вечарыны беларускай у нас ніколі не было, а спектакль быў адзін раз. Хаты з 3 ёсць, дзе можна зрабіць вечары, але не дазваляюць, бо блізка савецкай мяжы, – трэба выбіраць асобнае дазваленне. Як выбіраць гэта дазваленне – няведама. Кааператыў ёсць у Індры, але далёк ад нас. Калі быў у нас прыехаўшы інспектар беларускіх школ, гр. Пігулеўскі, дык ён быў падняўшы рух, каб зрабіць кааператыў, але далей ніхто не падняў гэтага руху, так асталося (...) Усе мы тутака – беларусы, але хто скажа, што-колечы аб беларусах, калі поп – маскаль, а ксёндз – паляк. Самі-ж мы яшчэ мала свядомыя*"[109].

Чарговай спробай актывізацыі кааператыўнай дзейнасці сярод латвійскіх беларусаў было заснаванне **Беларускага цэнтральнага сельскагаспадарчага таварыства "Араты".** Арганізацыя была створана ў верасні 1927 г. у Даўгаўпілсе, а яе ініцыятарам з'яўляўся, між іншым, С. Сахараў. Сядзіба арганізацыі месцілася ў Даўгаўпілсе па адрасе: *Dzelzceļu iela 24/4*. Таварыства адчыніла шэраг рэгіянальных аддзелаў на латгальскай правінцыі[110]. Кіраўніцтва таварыства запэўнівала, што яго мэтай з'яўляецца дапамога незаможным сялянам-беларусам ва ўзняцці сваіх гаспадарак да ўзроўню сялян іншых нацыянальнасцей[111]. У 1928 г. сярод кіраўніцтва таварыства нарадзілася думка стварыць беларускую сельскагаспадарчую бібліятэку з кнігазборам у 100 выдавецкіх пазіцый[112]. Акрамя таго, таварыства "Араты" адчыніла шэраг паказальных пасек, меліярацыйных аддзелаў, набывала сельскагаспадарчую тэхніку, праводзіла асветную працу сярод сялянства. У 1929 г. таварыства зладзіла 54 лекцыі, якія наведала 1 628 слухачоў. Напрыканцы 1929 г. арганізацыя зладзіла ў Індры сельскагаспадарчую выставу[113]. Таварыства ўтрымлівала сваім коштам двух аграномаў – у Лудзенскім і Даўгаўпілскім павеце. Яны праводзілі інструктарскую працу. 27 студзеня 1930 г. у Даўгаўпілсе адбыўся гадавы сход таварыства, на якім было прынята ў арганізацыю 144 новыя сябры. Акрамя таго, быў абраны

---

[108] Э. Екабсонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [в:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 66.

[109] *Беларускае жыцьцё у Латвіі*, "Голас беларуса" 1926, № 3 ад 20 красавіка, с. 3.

[110] Э. Екабосонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [в:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 68.

[111] LCVA, f. 368, ap. 1, b. 34, l. 6.

[112] LVVA, 2125 f., 5 ap., 11 l., 13 lp.

[113] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 100, л. 14.

новы склад управы: П. Жэрдзі (старшыня), У. Раткін (намеснік старшыні), кс. Я. Гайлевіч, У. Відаўскі (скарбнік), І. Фёдараў (сакратар), Д. Мяжэцкі і М. Альхоўка (кандыдаты). Сярод актывістаў таварыства былі таксама С. Сахараў, С. Казека, Я. Кастылюк[114].

На пачатак сакавіка 1930 г. таварыства планавала склікаць канферэнцыю меліярацыйных таварыстваў Краслаўска-Індрыцкага рэгіёну дзеля ўзгаднення далейшай працы[115]. У наступныя гады таварыства працягвала дзейнасць. У 1931 г. прадстаўнік таварыства інж. У. Відаўскі прачытаў на Лудзеншчыне шэраг лекцый пра сельскую гаспадарку[116]. У 1932 г. арганізацыя налічвала 25 аддзелаў і 17 машынна-пракатных пунктаў. Прадстаўнікі таварыства працягвалі ездзіць па Латгаліі і чытаць лекцыі пра сельскую гаспадарку[117]. На месцах вялася інструктарская земляробчая дзейнасць. Напрыклад, у Краслаўскай, Скайсценскай, Прыдруйскай, Пустынскай і часткова Асунскай і Каплаўскай валасцях інструктарам земляробства быў В. Ластаўскі, які прымаў зацікаўленых у Індры, Краслаўцы і Старой Слабадзе. Апрача таго, атрымаць прафесійную кансультацыю можна было ў сядзібе таварства[118].

Нягледзячы на вышэйзгаданую актыўнасць, беларуская дзейнасць у гаспадарчай і кааператыўнай галінах была нездавальняючай. Беларуская кааперацыя мусіла канкураваць з польскімі і латвійскімі арганізацыямі. Таму на старонках беларускай прэсы аўтары заклікалі сялян-беларусаў гуртавацца вакол сваіх нацыянальных кааператываў, а не папаўняць шэрагі "чужых"[119]. Тым не менш, у параўнанні з прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцей, працэнт беларусаў сярод уласнікаў гандлёвых прадпрыемстваў быў нязначны.

Тэатр і музыка

Неад'емнай часткай культурнага жыцця беларускай меншасці ў Латвіі была тэатральная дзейнасць. Як ужо адзначалася ў папярэднім раздзеле працы, у першай палове 1920-х гг. латвійскія беларусы запачаткавалі аматарскія тэатры. Да сярэдзіны 1920-х г. у Латгаліі і ў Рызе адбылося больш як 100 тэатральных выступаў з пастаноўкай беларускіх спектакляў[120].

---

[114] *Гадавы сход сяброў сельскагаспадарчага т-ва "Араты"*, "Наша доля" 1930. № 2 ад 7 лютага, с. 4.

[115] *Канфэрэнцыя міліарацыйных таварыстваў*, "Наша доля" 1930. № 2 ад 7 лютага, с. 2.

[116] *Беларускае сельска-гаспадарчае т-ва "Аратай"*, "Беларускае слова" 1931, № 1, с. 4.

[117] "Беларускае слова" 1931, № 1, с. 4.

[118] *Абвестка*, "Наша доля" 1930. № 3 ад 8 сакавіка, с. 3.

[119] *Да чытачоў*, "Гаспадар" 1926, № 1, с. 7.

[120] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 134, л. 58.

У другой палове 1920-х гг. гэта ідэя атрымала працяг. Пастаноўкай аматарскіх спектакляў займаліся культурна-асветныя таварыствы, якія, які вядома, разглядалі гэтую форму актыўнасці як камерцыйную дзейнасць. Адначасова сярод беларускіх актывістаў выспявала думка пра стварэнне беларускага тэатра, які мог бы аб'яднаць ужо існыя калектывы. У кастрычніку 1926 г. на старонках газеты "Голас беларуса" пачалася кампанія за стварэнне беларускага народнага тэатра ў Латвіі, які павінен быў дзейнічаць на грамадскіх асновах і мець падтрымку дзяржавы. 27 кастрычніка 1926 г. група беларускіх актывістаў (К. Езавітаў, У. Пігулеўскі, П. Жэрдзі, Я. Шчорс, М. Дзямідаў, П. Масальскі, А. Махноўскі і інш.) звярнуліся да грамадскасці з заклікам стварыць беларускае тэатральнае таварыства. Калі будзе створаная арганізацыя і беларускі тэатр, лічылі аўтары, можна будзе атрымаць грашовую падтрымку ад дзяржавы[121].

На пачатку 1927 г. сталічныя беларускія дзеячы звярнуліся да гарадскіх улад з просьбай зарэгістраваць вышэйзгаданую арганізацыю. 25 сакавіка 1927 г. Рыжскі акруговы суд зацвердзіў статут Беларускага тэатральнага таварыства ў Латвіі (БТТЛ) (*Baltkrievu Teatra Biedrība Latvijā*). Статут падпісалі: К. Езавітаў, У. Пігулеўскі, П. Масальскі, М. Дзямідаў і Вольга Бароўская-Пігулеўская[122]. Крыху раней, 5 сакавіка Рада Беларускага школьнага аддзела вызнала таварыства адзінай тэатральнай арганізацыяй беларускай меншасці ў Латвіі, якая мела права атрымліваць дапамогу са сродкаў Культурнага фонду Латвіі[123].

31 сакавіка 1927 г. у Рызе (*Valdemara iela 36a*) адбыўся сход ініцыятыўнай групы па стварэнні беларускага народнага тэатра ў Рызе, а таксама беларускага вандроўнага тэатра, які мусіў пачаць працу ўзімку 1927/1928 гг. 3 красавіка на кватэры М. Дзямідава адбыўся першы агульны сход сяброў БТТЛ[124], у якім пад старшынствам К. Езавітава і Л. Клагіш (сакратарка) узялі ўдзел 14 чал.[125] Прысутныя вырашылі ўлетку 1927 г. адчыніць драматычныя курсы для настаўнікаў беларускіх школ, каб падрыхтаваць іх да самадзейнай працы ў школах і вандроўным тэатры. Адначасова ўдзельнікі вырашылі звярнуцца ў Сойм, Культурны фонд Латвіі і рыжскае гарадское самакіраванне з просьбай выдаткаваць сродкі на падтрымку таварыства і тэатра. На гэтым

---

[121] *Аб беларускім нацыянальным тэатру у Латвіі*, "Голас беларуса" 1926, № 24 ад 27 кастрычніка, с. 1.

[122] LVVA, 1747 f., 1 apr., 18 l., 9 lp.; *Беларускае жыцьцё у Латвіі*, "Голас беларуса" 1927, № 7 ад 6 красавіка, с. 4.

[123] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 35 lp.

[124] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 5 lp.

[125] На сходзе прысутнічалі: К. Езавітаў, М. Дзямідаў, У. Пігулеўскі, В. Ластоўскі, С. Ластоўская, В. Бароўская-Пігулеўская, М. Лечман, Р. Плыгаўка, А. Родзька, С. Сіцько, Л. Сіцько, Л. Клагіш, Н. Пінская і С. Красневіч.

жа сходзе кіраўніцтву арганізацыі было даручана распрацаваць праект эмблемы і сцяга таварыства. Удзельнікі абралі ў кіраўніцтва К. Езавітава, Н. Пінскай, Л. Клагіш, М. Дзямідава і В. Бароўскай-Пігулеўскай, а таксама кандыдатаў – М. Краўчанку, У. Пігулеўскага і Р. Плыгаўку. Рэвізійная камісія складалася з С. Сахарава, С. Красневіча і А. Родзькі, кандыдатаў Я. Шчорса і П. Жэрдзі. Акрамя таго, удзельнікі вырашылі звярнуцца ў таварыства "Беларуская хата" па згоду выкарыстоўваць для беларускага народнага тэатра памяшканне па адрасе Sīmaņa iela, 14/16[126]. На першым сходзе кіраўніцтва БТТЛ, які адбыўся ў той жа дзень, былі размеркаваныя абавязкі: В. Пігулеўская-Бароўская (старшыня), К. Езавітаў (намеснік старшыні), Н. Пінская (сакратар), Л. Клагіш (скарбнік) і М. Дзямідаў (сябра). Абранне старшынёй В. Бароўскай-Пігулеўскай было невыпадковым, паколькі яна – выхаванка Маскоўскай кансерваторыі – была адзінай асобай, якая мела прафесійную тэатральную падрыхтоўку[127]. У выніку яна займала пасаду старшыні ТБТЛ на працягу амаль усяго часу існавання таварыства. Тым часам іншыя пасады ва ўправе займалі розныя асобы.

Табліца 30. Кіроўны склад Беларускага тэатральнага таварыства ў Латвіі (у выбраныя гады)

1927/28	1928/29	1930/31
В. Пігулеўская-Бароўская (старшыня) К. Езавітаў (нам. старшыні) Н. Пінская (сакратар) Л. Клагіш (скарбнік) М. Дзямідаў (сябра)	В. Пігулеўская-Бароўская (старшыня) У. Пігулеўскі (нам. старшыні) К. Езавітаў (скарбнік) М. Краўчанка (сакратар) М. Калінін (сябра) А. Трубяцкая М. Дзямідаў В. Бедарава	В. Бароўская-Пігулеўская (старшыня) К. Езавітаў (нам. старшыні, скарбнік) К. Мяжэцкі (сакратар) М. Дзямідаў (сябра) М. Краўчанка Я. Камаржынскі Н. Пінская
1931/32	**1932/33**	**1933/34**
В. Бароўская-Пігулеўская (старшыня) Я. Кудраўцоў (скарбнік) М. Дзямідаў (намеснік старшыні) К. Мяжэцкі (сакратар) Я. Камаржынскі (дырэктар тэатру) П. Масальскі Н. Пінская	В. Бароўская-Пігулеўская (старшыня) В. Доўгая (нам. старшыні) Я. Камаржынскі (скарбнік) У. Гусарэвіч (сакратар) Я. Каяла (сябра)К. Мяжэцкі М. Калінін	В. Бароўская-Пігулеўская (старшыня) В. Доўгая (нам. старшыні) М. Дзямідаў Я. Камаржынскі (скарбнік) У. Гусарэвіч (сакратар) М. Слосман Я. Каяла

Крыніца: LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 58 lp.; LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 87 lp.; LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 110 lp.; *У Латвіі,* "Родны край" № 1 ад 1 студзеня 1933 г., с. 7.

[126] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 7–10 lpp.

[127] Вольга Бароўская-Пігулеўская паводле паходжання была руская. На момант абрання яе старшынёй таварыства іншыя сябры арганізацыі пра гэта не ведалі. У сувязі з гэтым, на

Канцылярыя таварыства знаходзілася на кватэры старшыні В. Бароўскай-Пігулеўскай, на вуліцы Карабельнай, 16 (*Kuģu iela*)[128].

На чарговым пасяджэнні кіраўніцтва БТТЛ (23 жніўня 1927 г.) быў прыняты план працы таварыства, які прадугледжваў стварэнне ў Рызе, Даўгаўпілсе і Лудзы сталых драматычных труп. Яны павінны былі выступаць у гарадах і вёсках Даўгаўпілшчыны, Лудзеншчыны, Рэжыччыны і Ілукшчыны. Удзельнікі падкрэслівалі, што "*галоўным сваім заданнем Т-ва беларускага тэатра лічыць культурнае абслугоўванне беларускае сялянскае масы, якая жыве ў глухіх кутках Латгаліі і пакуль зусім не мае разумных забаў*"[129]. На гэтым жа паседжанні было вырашана, што пастаноўкі ў Рызе будуць праходзіць у будынках беларускіх школ, дзе ёсць сцэны. Тым часам у Даўгаўпілсе пастаноўкі меліся ладзіцца ў гарадскіх тэатральных залах і зале беларускай гімназіі. У Лудзы меркавалася ладзіць выступы ў мясцовай зале Круша, дзе ўжо раней бывалі беларускія спектаклі. Пастаноўкі ў вёсках планавалі рабіць у будынках беларускіх школ і валасных управах[130].

Таварыства пачало працу пры сціплым бюджэце, аснову якога складалі ўступныя ўнёскі сяброў (200 лат), сяброўскія складкі (300 лат) і ахвяраванні (200 лат). Аднак кіраўніцтва арганізацыі разлічвала папоўніць яго за кошт дапамогі з боку дзяржавы (Культурнага фонду Латвіі – 10 000 лат) і рыжскага самакіравання (4 000), а таксама выручкі з тэатральнай дзейнасці. У жніўні 1927 г. управа таварыства лічыла, што за 20 пастановак у Рызе можна будзе зарабіць 3 300 латаў, у Даўгаўпілсе – 2 400, у Лудзы – 2 400, а за 50 пастановак на правінцыі – яшчэ 2 000[131]. Кіраўніцтва БТТЛ звярнулася ў Культурны фонд Латвіі з просьбай вылучыць сродкі на дзейнасць тэатру. У звароце адзначалася: "*Таварыства Беларускага Тэатра лічыць патрэбным паведаміць Культурны Фонд аб тым, што ў пачатку сезона 1927/28 году Таварыства думае, апрача заўсёднага беларускага тэатра ў Рызе на Чырвонай Дзвіне, заснаваць яшчэ беларускі Вандроўны Тэатр і ў будучым летку адчыніць у Рызе Беларускую драматычную студыю. Усе тэатральныя пачынанні Таварыства думае праводзіць між незаможным і малакультурным беларускім жыхарствам у раёне Чырвонай Дзвіны, дзе дагэтуль не было тэатра, чаму і кошт білетаў мусіць быць па магчымасці ніжэйшы, там неабходна*

паседжанні цэнтральнай управы 6 кастрычніка 1927 г. было ўзнята пытанне пра скліканне агульнага сходу сяброў дзеля абмеркавання справы. Аднак К. Езавітаў і Н. Пінская адзначылі, што, нягледзячы на тое, што яны са спазненнем даведаліся пра небеларускую нацыянальнасць В. Бароўскай, яны не супраць таго, каб яна займала пасаду старшыні, паколькі з'яўляецца найбольш адпаведнай асобай. LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 20–21 lpp.

[128] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 11 lp.

[129] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 15 lp.

[130] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 15–16 lpp.

[131] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 17 lp.

развіць інтэнсіўнейшую культурную працу. Тое самае можна сказаць і пра беларускія вёскі на правінцыі. Усё зазначанае немагчыма здзейсніць без дапамогі, а таму спадзеямося, што Культуры Фонд не адмовіцца падтрымаць пачынанні Таварыства Беларускага Тэатра"[132]. Тым часам у звароце па дапамогу да Міністэрства асветы патрэба ў дзейнасці тэатру абгрунтоўвалася наступным чынам: "*Просячы аб дапамозе, Таварыства звяртае ўвагу Міністэрства на тое, што: 1) усе тэатральныя пачынанні таварыства накіраваны на тое, каб задаволіць культурныя патрэбы незаможнага і малакультурнага беларускага жыхарства, пражываючага ў самы глухім кутку Латвіі – у ўсходняй Латгаліі, дзе ніхто апрача беларускіх арганізацый не вядзе ніякае культурна-асветнае працы. 2) беларуская меншасць за ўвесь час незалежнага існавання Латвійскае дзяржавы аж да гэтага часу не атрымлівала ні ад Урада, ні ад Культурнага Фонду ніякіх дапамог на тэатральную працу, а таму належная падтрымка пачынанняў таварыства ў гэтым годзе асабліва патрэбна*"[133]. Кастусь Езавітаў лічыў, што тэатру, каб пачаць працу, неабходна будзе атрымаць грашовую дапамогу яшчэ да пачатку тэатральнага сезона[134]. Таму, не чакаючы разгляду вышэйзгаданых зваротаў, Рада БША прызначыла на арганізацыю беларускага тэатра 1 тыс. латаў[135].

Колькасць сяброў БТТЛ паступова павялічвалася. 25 сакавіка 1928 г. у яго склад было прынята 13 новых сяброў, у тым ліку Пятро Журкоўскі, Міхась Калінін, Якуб Воркуль, Казімір Мяжэцкі, Вікторыя Доўгая, Вольга Бедарава, Анастасія Крэйц, Варвара Крэйц і інш.[136] Аднак далёка не ўсе сябры рэгулярна плацілі складкі, за што былі выключаныя з арганізацыі[137]. Праз тры гады ў спісе сяброў Рыжскага аддзела ТБТЛ, якія плацілі складкі, было 32 асобы[138].

Згодна з пастановай управы ад 23 жніўня 1927 г., з мэтай падрыхтоўкі прафесійнай трупы было вырашана адчыніць у Рызе 2-гадовыя драматычныя курсы[139]. На пасяджэнні было прынята рашэнне адкрыць аддзелы таварыства ў Даўгаўпілсе і Лудзы, арганізацыя якіх даручалася адпаведна С. Сахараву і С. Казеку[140]. Восенню 1927 г. у Рызе і ў Даўгаўпілсе пачаліся заняткі ў драматычных студыях, якія наведвалі ахвотныя выступаць на сцэне. Слухачы беларускіх навучальных устаноў былі вызваленыя ад аплат за

---

[132] LVVA, 1747 f., 1 apr., 25 l., 3 lp.
[133] LVVA, 1747 f., 1 apr., 25 l., 5 lp.
[134] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 96, л. 1–9.
[135] LVVA, 2125 f., 5 ap., 10 l., 13 lp.
[136] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 43 lp.
[137] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 28 lp.
[138] LVVA, 2125 f., 5 apr., 24 l., 23 lp.
[139] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 16 lp.
[140] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 17 lp.

навучанне ў студыі, а сябры БТТЛ плацілі па 3 латы за семестр, усе іншыя – па 6 латаў (пастанова цэнтральнага праўлення ад 19.02.1928)[141]. Адначасова пачаўся запіс у новае таварыства, фармаванне труп і закупка абсталявання[142]. За год існавання БТТЛ удалося стварыць дзве беларускія тэатральныя трупы – у Рызе і Даўгаўпілсе[143]. Варта больш уважліва прасачыць іх працу.

Рыга. На запрашэнне В. Бароўскай-Пігулеўскай і К. Езавітава беларускай драматычнай трупай у Рызе пагадзіўся за месячную аплату ў 200 латаў кіраваць артыст Рускага драматычнага тэатра Юроўскі. 18 кастрычніка 1927 г. ён атрымаў запрашэнне ўвайсці ў склад цэнтральнага праўлення таварыства[144]. Аднак супрацоўніцтва не выглядала найлепш. 26 кастрычніка 1927 г. артыст пачаў заняткі з беларускай трупай, але амаль адразу іх спыніў спасылаючыся на занятасць. Спробы скантактавацца з ім не далі выніку[145]. У сувязі з гэтым цэнтральнае праўленне (13 снежня 1927 г.) вырашыла даручыць У. Пігулеўскаму пошук новага рэжысёра[146]. Часова спектаклі пагадзіўся рэжысіраваць К. Езавітаў. Новым рэжысёрамі трупы стаў вучань Канстанціна Станіслаўскага і артыст Латвійскага тэатру Ян Шаберт. Акрамя гэтага, свае рэжысёрскія здольнасці выпрабоўваў Я. Камаржынскі. У рыжскай трупе было 22 удзельнікі. Аснову трупы складалі былыя выхаванцы Даўгаўпілскай беларускай гімназіі, якія пераехалі ў Рыгу і працавалі настаўнікамі сталічных школ, а таксама слухачы беларускіх настаўніцкіх курсаў, студэнты Латвійскага ўніверсітэта і Латвійскай акадэміі мастацтваў. Сярод найбольш актыўных артыстаў належыць узгадаць Барыса Іванова, Юзэфу Васілеўскую, Аркадзя Рытава, Антона Лейтана, Паўла Хруцкага, Рыгора Крэйца, Міхася Калініна, Антона Доўгага, Веру Хлебнікаву, Вольгу Аляксееву, Марыю Мадзялеўскую, Міколу Нікізіна, Міхася Краўчанку, Анастасію Крэйц, Антаніну Гарбачонак, Кацярыну Зэйгліш, Мечыслава Слосмана, Франца Оруба[147]. Паколькі значную частку артыстаў складалі слухачы настаўніцкіх курсаў, кіраўніцтва БТТЛ ухваліла (27 лістапада 1927 г.) зварот да кіраўніцтва БША і адміністрацыі Рыжскіх беларускіх настаўніцкіх курсаў з просьбай дазволіць слухачам у вольны час наведваць заняткі тэатральнага мастацтва, а таксама ўвесці ў праграму курсаў прадмет па драматычным мастацтве, паколькі гэтыя веды былі неабходныя настаўнікам, якія рыхтавалі

---

[141] LVVA, 1747 f., 1 apr., 25 l., 19 lp.

[142] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 134, л. 58.

[143] Тэатрал, *Да пяцігодзьдзя Т-ва Беларускага Тэатру ў Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 1(11), с. 14.

[144] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 18, 24 lpp.

[145] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 27 lp.

[146] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 32 lp.

[147] LVVA, 1747 f., 1 ap., 19 l., 142 lp.; Кастусёнак, *Беларускі Народны Тэатр у Рызе*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1928, № 8(1), с. 122–123.

спектаклі ў вясковых школах[148]. Трупа пакутавала праз адсутнасць уласнага памяшкання, на якое не ставала грошай. Артысты былі вымушаныя "вандраваць" па Рызе. З сакавіка 1928 г. кіраўніцтва БТТЛ арандавала на патрэбы трупы залу ў сядзібе таварыства "Беларуская хата"[149]. Аднак з траўня 1931 г. рэпетыцыі адбываліся ў пакоі ў будынку Рыжскіх беларускіх настаўніцкіх курсаў[150]. Каб скараціць выдаткі, 1 кастрычніка 1932 г. на агульнага сходзе сяброў БТТЛ было вырашана завязаць супрацоўніцтва з Габрэйскім рабочым тэатрам, каб разам карыстацца памяшканнем гэтага тэатра[151].

"Беларускі Народны Тэатр у Рызе" (так з гонарам называлі яго беларускія актывісты) пачаў працу 24 сакавіка 1928 г. Прэм'ера адбылася ў сядзібе таварыства "Беларуская хата" на Саркандаўгаве, куды ў якасці ганаровых гасцей былі запрошаны прадстаўнікі прэсы, Культурнага фонду Латвіі і іншых устаноў[152]. У гэты дзень была пастаўленая п'еса Я. Купалы *Паўлінка*, на якую прыйшло шмат гледачоў. Выручка за імпрэзу склала 66,37 латаў[153]. Пачатак быў шматабяцальны, пра што сведчыў прысутны на выступе К. Езавітаў. Дзеяч адзначаў, што грамадскасць цёпла павітала артыстаў, якія пры належным мастацкім кіраўніцтве з цягам часу мелі шанец выявіць свой талент[154]. Пасля гэтага рыжскі калектыў зладзіў шэраг выступаў на правінцыю. 25 сакавіка 1928 г. кіраўніцтва БТТЛ зацвердзіла план паказаў *Паўлінкі* ў Краславе (9 красавіка), Пустыне (10 красавіка) і Рунданах (16 красавіка) у школьных залах, у Старой Слабадзе (17 красавіка) у памяшканні валасной рады[155]. У выніку Рыжскі аддзел зарабіў 108,72 латаў[156].

10 чэрвеня 1928 г. адбыўся агульны сход сяброў таварыства (старшыня М. Дзямідаў, сакратар А. Сальцэвіч), у якім удзельнічала 22 чал.[157] Падчас дыскусіі А. Сальцэвіч прапанаваў звярнуць большую ўвагу на тэатральную працу ў Латгаліі, з чым пагадзіліся іншыя выступоўцы – У. Пігулеўскі, К. Езавітаў і М. Дзямідаў. Апошні адзначыў, што Даўгаўпілс не мае творчых сіл, якія ёсць у Рызе, маючы на ўвазе слухачоў настаўніцкіх курсаў. Таму

---

148 LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 28 lp.

149 LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 42 lp.

150 LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 43 lp.

151 *У Латвіі,* "Родны Край" № 1 ад 1 студзеня 1933 г., с. 7.

152 LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 40 lp.

153 LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 45 lp.

154 LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 42 lp.

155 LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 44 lp.

156 LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 47 lp.

157 Гэты былі: В. Бароўская-Пігулеўская, М. Дзямідаў, А. Сальцэвіч, У. Пігулеўскі, Л. Клагіш, Н. Пінская, К. Езавітаў, А. Крэйц, В. Крэйц, П. Хруцкі, М. Калінін, М. Краўчанка, М. Іваноў, В. Доўгая, Гірсанаў, Ю. Васілеўская, Г. Жукава, С. Мяжэцкая, В. Бедарава, М. Трубяцкой, Смірнова, Р. Плыгаўка. LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 56 lp.

на прапанову К. Езавітава сход прыняў рэзалюцыю аб узмацненні працы тэатра ў Рызе з адначасовай арганізацыяй "Беларускага Народнага Тэатра ў Даўгаўпілсе". Акрамя таго, у дакуменце звяралася ўвага на патрэбу тэатральнай падрыхтоўкі настаўніцтва "да вядзення тэатральнай працы на вёсцы". Каб пашырыць рэпертуар было вырашана перакладаць на беларускую мову замежныя п'есы[158]. 14 чэрвеня 1928 г. кіраўніцтва таварыства выказала жаданне стварыць тэатральную бібліятэку з беларускіх п'ес. На гэтую мэту было выдаткавана 60 латаў[159]. У выніку К. Езавітаў набыў некалькі першых кніг на рускай мове[160]. 30 верасня 1929 г. праўленне ўхваліла зварот да Беларускага выдавецтва ў Латвіі з просьбай перадаць каталог беларускай тэатральнай літаратуры. 28 кастрычніка кіраўніцтва пастанавіла закупіць частку прадукцыі[161].

На 3-м агульным сходзе сяброў БТТЛ (17 чэрвеня 1928 г.) было вырашана звярнуцца ў Латвійскую раду пазашкольнай асветы (*Latvijas aprusskolas izglītības padome*) з прапановай прыняць таварыства ў яго склад[162]. 11 верасня 1928 г. цэнтральная ўправа прапанавала ўвесці ў праграму Рыжскіх беларускіх настаўніцкіх курсаў хоць у мінімальным памеры лекцыі па драматычным мастацтве. Рашэнне абгрунтоўвалася тым, што большасць актораў "Беларускага Народнага Тэатра ў Рызе" складалі слухачы гэтых курсаў[163]. У гэты ж дзень кіраўніцтва БТТЛ ухваліла план на сезон 1928/29 гг., згодна з якім мусілі быць пастаўленыя п'есы *На Антокалі* Францішка Аляхновіча, *Блудны сын* Рудольфа Блаўмана і *Кастусь Каліноўскі* Еўсцігнея Міровіча. Таксама кіраўніцтва мела намер паўтарыць *Паўлінку* і "малыя п'есы"[164]. Аднак рэжысёр Я. Шаберт быў настолькі заняты, што адмовіўся ад супрацоўніцтва з БТТЛ, прапанаваўшы на сваё месца іншага рэжысёра, Мэрца Шаберта[165]. 18 лістапада 1928 г. у сядзібе таварыства "Беларуская хата" адбылася першая пастаноўка п'есы *Блудны сын*, прыбытак ад якой склаў 137,10 латаў. Таксама кіраўніцтва арганізацыі раздало 30 бясплатных квіткоў вучням сталічных беларускіх школ. Выдаткі, звязаныя з падрыхтоўкай і паказам спектакля (дэкарацыі, касцюмы акцёраў, арэнда залы і яе абслугоўванне), склалі 479,34 латаў[166]. Паколькі сталічныя акцёры планавалі тэатральныя турнэ па латгальскіх вёсках, 11 верасня 1928 г. кіраўніцтва вырашыла звярнуцца да Рады міністраў

---

[158] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 58 lp.
[159] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 66 lp.
[160] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 85 lp.
[161] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 126, 134 lpp.
[162] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 72 lp.
[163] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 74 lp.
[164] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 75–76 lpp.
[165] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 77 lp.
[166] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 86, 90 lpp.

у справе атрымання дазволу на льготны праезд чыгункай[167]. 30 лістапада 1928 г. Міністэрства шляхоў зносін задаволіла просьбу беларусаў[168].

Праца калектыву не заўсёды ішла беспраблемна. 20 лістапада 1928 г. цэнтральнае праўленне пастанавіла выкрасліць са складу М. Трубецкага, які ўхіляўся ад удзелу ў рэпетыцыі спектаклю *Блудны сын*, а потым абвінаваціў К. Езавітава ў хамскім стаўленні да яго[169].

1 снежня 1928 г. беларускія акцёры зноў паставілі п'есу *Блудны сын*. Гэтым разам прыбытак склаў 66,78 латаў[170]. 2 снежня 1928 г. кіраўніцтва БТТЛ вырашыла запрасіць у склад таварыства ўсіх артыстаў рыжскай трупы[171]. У студзені 1929 г. рэжысёр М. Шаберт адмовіўся ад далейшай працы ў беларускім тэатры, рэкамендуючы на сваё месца артыста Міхала Зацкага[172]. 5 лютага 1929 г. кіраўніцтва таварыства прызначыла новым кіраўніком трупы Я. Камаржынскага, а М. Краўчанку – кіраўніком па гаспадарчай частцы[173]. З цягам часу рыжская беларуская тэатральная трупа набывала досвед і пачынала рабіць поспехі. Паўплываў на гэта факт, што акторскі калектыў складаўся з жыхароў сталіцы. 8 студзеня 1929 г. праўленне вырашыла звярнуцца да кіраўніцтва Рыжскіх беларускіх настаўніцкіх курсаў з прапановай арганізаваць заняткі для слухачоў такім чынам, каб яны маглі ўзяць удзел у пастаноўцы п'есы *На Антокалі*[174]. 28 студзеня 1929 г. на Саркандаўгаве адбыўся спектакль, паводле гэтай п'есы, а 12, 13, 19 і 20 студзеня ставілі п'есу *Блудны сын*[175].

Таварыства ўдзельнічала ў культурных ініцыятывах іншых беларускіх арганізацый. На пасяджэнні праўлення 15 студзеня 1929 г. было ўхвалена рашэнне далучыцца да святкавання Дзён беларускай культуры (адказны К. Езавітаў) і адкамандзіраваць В. Бароўскую-Пігулеўскую ў склад Аб'яднанага камітэта беларускіх арганізацый, які ладзіў вышэйзгаданае мерапрыемства[176]. 9 сакавіка 1929 г., супольна з таварыствам "Беларуская хата", артысты рыжскай трупы паставілі п'есу *На Антокалі* зарабіўшы 58,50 латаў[177].

11 лістапада 1929 г. на прапанову Я. Камаржынскага праўленне зацвердзіла склад "сталай трупы Рыжскага народнага тэатра", у якую ўвайшлі:

---

[167] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 75 lp.
[168] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 91 lp.
[169] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 88 lp.
[170] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 93 lp.
[171] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 91 lp.
[172] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 99 lp.
[173] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 107 lp.
[174] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 100 lp.
[175] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 94 lp.
[176] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 101, 106 lpp.
[177] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 115–117 lpp.

Я. Камаржынскі, М. Краўчанка, Я. Кудраўцоў, Павел Хруцкі, Дзмітрый Сахараў, Зінаіда Мадзялеўская, Анастасія Крэйц, Варвара Крэйц, Люцыя Тэтар і Сцяпан Краўчанка. Акрамя таго, было вырашана прапанаваць далучыцца да трупы М. Дзямідаву, В. Доўгай, Н. Пінскай[178]. З цягам часу колькасць артыстаў павялічылася[179].

У 1929/30 гг. у рэпертуары рыжскай трупы з'явілася новыя п'есы: *Манька* (у 4-х дзеях), *Каліна* (у 2-х дзеях), *Шчаслівы муж* і *Апошняе спатканне* Уладзіслава Галубка. Вядома, што ў 1929 г. трупа паставіла п'есы *Паўлінка* (у Рызе 2 лютага і ў Ліепаі 28 верасня), *На Антокалі* (9 сакавіка і 14 ліпеня), *Манька* (Рыга, 23 лістапада, 30 лістапада)[180]. У гэты час граліся таксама ранейшыя творы *Паўлінка* і *Блудны сын*[181]. Таварыства ладзіла спектаклі, выручка з якіх ішла на падтрымку настаўніцкіх курсаў і школ. Напрыклад, у студзені 1930 г. да кіраўніцтва ТБТЛ звярнулася 1-я Рыжская беларуская школа з просьбай зладзіць 18 студзеня вечарыну на карысць школы. Цэнтральнае праўленне задаволіла просьбу, пагадзіўшыся паставіць п'есу *Паўлінка*[182].

6 студзеня 1930 г. на прапанову М. Дзямідава кіраўніцтва БТТЛ залічыла ў бягучы рэпертуар пастаноўкі новых п'ес: *Раскіданае гняздо* Я. Купалы і *Дзядька Якуб* Ф. Аляхновіча, якія павінна была граць артысты Марыя Доўгая, Вікторыя Доўгая, Станіслаў Доўгі, Антон Доўгі, Пятро Масальскі, Язэп Камаржынскі і Ян Кудраўцоў[183].

2 лютага 1930 г. адбыўся агульны сход сяброў БТТЛ (старшыня П. Жэрдзі, сакратар А. Рытаў), у якім узяло ўдзел 22 чал.[184] Прысутныя казалі пра патрэбу стварыць пры таварыстве гурток літаратараў-перакладчыкаў (прапанова М. Дзямідава) і хор (прапанова К. Езавітава). Апошні выказаў ідэю звярнуцца

---

[178] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 139 lp.

[179] Сярод артыстаў рыжскай трупы належыць узгадаць: Барыса Іванова, Юзэфу Васілеўскую, Аркадзя Рытава, Антона Лейтана, Паўла Хруцкага, Рыгора Крэйца, Міхася Калініна, Антона Доўгага, Веру Хлебнікаву, Вольгу Аляксееву, Марыю Мадзялеўскую, Міколу Нікізіна, М. Краўчанку, Анастасію Крэйц, П. Раманоўскую, А. Лукашэвіч, Паўліну Квачову, Казіміра Мяжэцкага, С. Мяжэцкую, Г. Жукаву, Антаніну Гарбачонак, Кацярыну Зэйгліш, Д. Сакалова, Мечыслава Слосмана, Франца Оруба і іншых. LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 142 lp.

[180] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 141 lp.; LVVA, 2125 f., 5 apr., 24 l., 275 lp.; LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 146 lp.

[181] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 129 lp.

[182] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 148 lp.

[183] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 158–159 lpp.

[184] Гэта былі: В. Бароўская-Пігулеўская, К. Езавітаў, М. Дзямідаў, М. Езавітава, Я. Камаржынскі, В. Доўгая, С. Сіцько, Л. Тэтар, А. Рытаў, П. Жэрдзі, А. Чаркоўскі, М. Слосман, В. Хлебнікава, Л. Булаўская, П. Квачова, М. Мацьвіенка, Я. Мяжэцкі, К. Мяжэцкі, М. Нікіцін, К. Казакевіч, Ф. Оруб і Ал. Лукашэвіч. LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 153 lp.

да беларускіх школ, каб у іх мурах з удзелам дырыжораў ствараліся хоры пры аддзелах БТТЛ[185]. Запіс у сталічны хор адбываўся ў перыяд з 5 па 15 чэрвеня 1930 г. у памяшканні 2-й Рыжскай беларускай школы (у серады) і 2-й Рыжскай беларускай школы (у нядзелі)[186]. У выніку быў створаны хор пад кіраўніцтвам Міхаіла Грыўскага, грамадзяніна Эстоніі[187]. Касцюмы для ўдзельнікаў хору запраектавала А. Крэйц[188]. Хор узяў удзел у святкаванні 13-й гадавіны абвяшчэння БНР (25 сакавіка 1931 г.), зладжаным у Рыжскай беларускай дадатковай школе[189]. Ад моманту стварэння да траўня 1931 г. хор выступаў чатыры разы[190]. 20 сакавіка 1931 г. кіраўніцтва БТТЛ выказала згоду на выступ беларускага хору на хвалях рыжскага радыё[191].

Паступова БТТЛ знаходзіла прыхільнікаў па-за сталіцай. На пасяджэнні 5 кастрычніка 1929 г. кіраўніцтва таварыства абмеркавала пытанне адкрыцця аддзелаў у Ляўдарах і Лудзы. З гэтай мэтай кіраўніцтва вырашыла ўвайсці ў зносіны з Я. Хруцкім і Раманоўскім, а таксама С. Казекам[192]. У сакавіку 1930 г. пры Ліепайскім аддзеле таварыства "Беларуская хата" быў створаны драматычны гурток, які паставіў п'есы *Перыстая красуля* (двойчы) і *На вёсцы*. Кіраўнік таварыства М. Дзямідаў на пасяджэнні кіраўніцтва БТТЛ (27 сакавіка 1930 г.) адзначыў, што ён не супраць, каб гурток лічыўся аддзелам БТТЛ. Цэнтральнае праўленне прыняло рашэнне стварыць Ліепайскі аддзел, загадала склікаць сход і камандзіраваць туды К. Езавітава. Было таксама вырашана выслаць лібаўчанам 9 п'ес у двух асобніках[193].

Асобы, якія далучыліся да "Беларускага народнага тэатра ў Рызе" падзяляліся на артыстаў, харыстаў, музыкаў і танцораў. Аплата працы ўдзельнікаў калектыву адбывалася на наступных умовах: артыст атрымліваў 1 лат за рэпетыцыю, а харыст, музыка і танцор – 50 сантымаў. За выступ у спектаклі артыст атрымліваў ад 1 да 20 латаў, а астатнія – па 50 сантымаў[194]. Удзельнікі трупы былі абавязаныя ўдзельнічаць ва ўсіх яе спектаклях, драматычных і літаратурных вечарынах. Творчай працай кіраваў рэжысёр

---

[185] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 156–157 lpp.

[186] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 168 lp.

[187] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 185, 187 lpp.

[188] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 11 lp.

[189] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 24 lp.

[190] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 36 lp.

[191] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 24 lp.

[192] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 129 lp.

[193] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 163 lp.

[194] Напрыклад, за першую пастаноўку п'есы *Блудны сын* артысты атрымалі па 10 лат, а за кожную наступную – па 5 (LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 140 lp.). За ўдзел у пастаноўцы п'есы *Пашыліся ў дурні* (31 снежня 1933 г.) кожны сярод 14 артыстаў атрымаў 1,40 латы (LVVA, 1747 f., 1 apr., 29 l., 51 lp.).

або яго памочнік. Паводле рэгламенту, рэпетыцыя магла доўжыцца не больш як тры гадзіны, а час генеральнай рэпетыцыі вызначаў рэжысёр. За спазненне на рэпетыцыю артыст караўся 50 сантымамі (калі спазняўся менш як на паўгадзіны) і 1 латам (больш за паўгадзіны). У выпадку харыстаў, музыкаў і танцораў гэтыя сумы складалі, адпаведна, 25 і 50 сантымаў. Калі ўдзельнік не з'явіўся на рэпетыцыю без важкай прычыны, ён мог страціць ролю і ганарар за ўдзел у мінулых рэпетыцыях. За з'яўленне ў нецвярозым стане быў прадугледжаны штраф у 2 латы[195]. Нягледзячы на суровы статут трупы, некаторыя яе ўдзельнікі ставіліся да абавязкаў несумленна. Сведчыць пра гэта факт, што на прапанову К. Казакевіча агульны сход пастанавіў караць штрафам тых, хто "неакуратна адведваў спеўкі"[196]. На пасяджэнні цэнтральнага праўлення БТТЛ 5 сакавіка 1929 г. Я. Камаржынскі адзначыць, што артысты "*адносяцца да сваіх абавязкаў дужа нядбала: ролі ведаюць кепска, жадання добра працаваць не назіраецца. Артыст Вайноўскі сённека з рэпетыцыі ўцёк. Наогул пры рэпетыцыях курсанты вучыцельскіх курсаў з'яўляюцца неакуратна, шмат часу ўходзі на чаканне спазніўшыхся грамадзян*"[197]. З цягам часу вынікі працы актораў палепшыліся. Ужо 28 кастрычніка 1929 г. Я. Камаржынскі на чарговым пасяджэнні кіраўніцтва БТТЛ адзначаў, што падрыхтоўка актораў да пастаноўкі п'есы *Манька* ідзе вельмі добра, а артысты старанна развучваюць ролі[198]. Пазней Я. Камаржынскі скардзіўся на паводзіны У. Гусарэвіча і М. Калініна, якія "неакуратна адведваюць студыю". У выніку праўленне вырашыла зрабіць ім заўвагу[199].

З мэтай пашырэння рэпертуару 20 лютага 1930 г. кіраўніцтва таварыства вырашыла закупіць у кааператыве "Культура і праца" па 10 асобнікаў беларускіх п'ес *Раскіданае гняздо*, *Заручыны Паўлінкі*, *Птушка шчасця*, *Калісь*, *На вёсцы*, *Страхі жыцця*, *Шчаслівы муж*, *Апошняе спатканне*[200]. Акрамя таго, частка п'ес і тэатральнай літаратуры была замоўлена ў кнігарні Беларускага навуковага таварыства ў Вільні[201]. 21 траўня 1930 г. управа БТТЛ ухваліла рашэнне зладзіць тэатральны "рэйд" па правінцыі і паказаць п'есу *Калісь* у Лудзы і Зілупе[202]. Узнікла, аднак, нетыповая сітуацыя: мясцовыя ўлады ў Рунданах забаранілі сябру БТТЛ Янку Зэйглішу ставіць п'есу.

---

[195] LVVA, 1747 f., 1 apr., 28 l., 54 lp.
[196] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 37 lp.
[197] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 110 lp.
[198] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 131 lp.
[199] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 59 lp.
[200] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 160 lp.
[201] LVVA, 1747 f., 1 apr., 25 l., 57 lp.
[202] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 167 lp.

На пасяджэнні ўправы таварыства 12 чэрвеня 1930 г. М. Дзямідаў ініцыяваў зварот у МУС з просьбай дазволіць пастаноўку[203].

Важным набыткам Рыжскага аддзела БТТЛ было далучэнне да яго маладога латгальскага беларуса П. Масальскага. 10 траўня 1930 г. кіраўніцтва таварыства пазітыўна разгледзела яго заяву на ўступленне. Маладзён выказаў жаданне працаваць адміністратарам дырэкцыі тэатра ў Рызе, дапамагаць скарбніку і арганізацыі хору. Ён абяцаў у будучым заняцца арганізацыяй вандроўнага тэатра па вёсках[204]. І з часам ён апраўдаў давер беларускага актыву. Аднак значнай стратай для арганізацыі быў выхад з яе восенню 1930 г. аднаго з найбольш актыўных сяброў К. Езавітава. Выход дзеяча быў наступствам яго арышту палітычнай паліцыяй[205].

17 кастрычніка 1930 г. кіраўніцтва БТТЛ прыняло рашэнне далучыцца да Хаўрусу латышскага працоўнага тэатра. У межах супрацоўніцтва беларускі бок накіраваў вучыцца тэатральнаму мастацтву чатырох сяброў таварыства, з якіх двое, аднак, не скончылі навучання[206]. 21 кастрычніка цэнтральнае праўленне вырашыла стварыць беларускі балетны калектыў, арганізацыя якога была даручана В. Доўгай[207]. На патрэбы таварыства напрыканцы 1930 г. П. Масальскі пераклаў п'есы Тараса Шаўчэнкі *Назар Стадоля* і Яніса Райніса *Бацькава сэрца*[208]. 30 лістапада 1930 г. у Новым Мільграбене была пастаўленая п'еса *Манька*, у якой сыгралі З. Мадзялеўская, В. Белінская, Я. Камаржынскі, Д. Сахараў, А. Чаркоўскі, М. Мацвіенка, Ф. Оруб, М. Нікіцін, У. Ціхаміраў і К. Казакевіч[209].

У 1931 г. артысты рыжскага тэатра пачалі ставіць п'есы Ф. Аляхновіча *Пан міністр* і *Мікітаў лапаць*. Прэм'ера апошняга адбылася 28 лютага ў Рызе[210]. У сувязі з зыходам М. Шаберта кіраўніцтва БТТЛ вырашала прапанаваць працу рэжысёра Рускага драматычнага тэатру Юрыйсу дэ Бурсу (*Jurijs De-Burs*)[211]. Пад яго кіраўніцтвам 18 (у Рускім народным доме),

---

[203] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 172 lp.

[204] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 164 lp.

[205] У сувязі з арыштам К. Езавітава 5 верасня 1930 г. кіраўніцтва БТТЛ вырашала замест яго ў склад органу запрасіць Я. Камаржынскага (LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 176 lp.). Падчас арышту ў К. Езавітава была канфіскавана касавая кніга. У сувязі з гэтым праўленне таварыства 5 верасня 1930 г. даручыла новаму скарбніку Я. Камаржынскаму забраць яе з паліцыі (LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 181 lp.). 15 лістапада 1930 г. цэнтральнае праўленне задаволіла заяву К. Езавітава пра выхад з БТТЛ па незалежных ад яго прычынах (LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 12 lp.).

[206] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 7, 36 lpp.

[207] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 8 lp.

[208] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 12 lp.

[209] LVVA, 2125 f., 5 apr., 24 l., 195 lp.

[210] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 18 lp.

[211] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 19 lp.

31 студзеня (у Торнкальнскай зале дапаможнага таварыства), 7 лютага (у Лудзы) і 14 лютага 1931 г. (у 2-й школе ў Рызе) была пастаўлена п'еса *Пан міністр*, у якой сыгралі У. Гусарэвіч, Ганна Шаўцова, А. Крэйц, П. Масальскі, М. Калінін, Вячаслаў Цішкевіч, Караль Казакевіч, Станіслаў Рацін, Ян Каяла, Антон Кроман[212]. 28 лютага, 25 сакавіка і 2 траўня 1931 г. рыжская трупа зладзіла паказ п'ес *Гірт і воўк* і *Мікітаў лапаць*[213]. 13 сакавіка кіраўніцтва БТТЛ прыняло ў склад арганізацыі 21 новага сябра. У іх ліку былі Я. Каяла, У. Гусарэвіч, А. Кудраўцова, К. Казакевіч, Г. Бедарава, М. Даль і інш.[214]

Большасць акцёраў трупы не мелі прафесійнай тэатральнай падрыхтоўкі. У 1930 г. у драматычнай студыі рабочага тэатра вучыліся толькі тры акцёры-беларусы: П. Масальскі, Ганна Шаўцова і В. Крэйц[215]. У сувязі з гэтым якасць працы трупы ацэньвалася па-рознаму. Напрыклад, К. Езавітаў лічыў дзейнасць рыжскай трупы нездавальняючай і сцвярджаў, што адной з прычын кепскага ўзроўню ігры на сцэне з'яўляецца адсутнасць уласных рэжысёрскіх кадраў, вынікам чаго было "пазычанне" рэжысёраў ад іншых народаў. Апошнія, на яго думку, не дбалі пра выхаванне беларускіх артыстычных сіл, паколькі разглядалі працу ў беларускім тэатры выключна як сродак дадатковага заробку. Дзеяч крытычна ацэньваў працу рыжан у параўнанні з дзвінчанамі, нягледзячы на тое, што першыя мелі лепшыя матэрыяльныя магчымасці, бо атрымлівалі падтрымку ад кіраўніцтва арганізацыі. Праз гэта, пісаў ён, акцёры страцілі матывацыю, каб добра працаваць[216]. Каб узняць узровень майстэрства артыстаў 30 траўня 1931 г. кіраўніцтва БТТЛ прыняло ўхвалу аб стварэнні пры таварыстве студыі (250 гадзін на працягу года) на чале з Ю. дэ-Бурса[217]. Акрамя таго, кіраўніцтва БТТЛ бачыла патрэбу пераймання досведу іншых рыжскіх тэатраў і вырашыла звярнуцца ў іх з просьбай даць беларускім артыстам кантрамаркі. У прыватнасці, К. Езавітаў самастойна дамовіўся пра гэта з Рабочым тэатрам[218].

12 траўня 1931 г. у памяшканні Рыжскіх беларускіх настаўніцкіх курсаў быў скліканы чарговы агульны сход сяброў таварыства (старшыня Я. Кудраўцоў, сакратар П. Масальскі), у якім удзельнічала 30 чал.[219] На гэты

---

[212] LVVA, 2125 f., 5 apr., 24 l., 46, 49 lpp.

[213] LVVA, 2125 f., 5 apr., 24 l., 23 lp.

[214] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 22 lp.

[215] *Беларускі тэатр у Латвіі*, "Шлях праўды" 1930, 24 X, с. 3.

[216] Тэатрал, *Рыскаму Беларуск. Народн. тэатру трэба падцягнуцца*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 1(18), с. 266.

[217] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 73 lp.

[218] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 174 lp.

[219] Гэта былі: Я. Камаржынскі, К. Мяжэцкі, Н. Пінская, Я. Кудраўцоў, Л. Тэтар, В. Доўгая, В. Бароўская-Пігулеўская, В. Крэйц, Г. Бедарава, П. Масальскі, А. Рытаў, М. Дзямідаў, Марыя Мацвіенка, П. Раманоўская, М. Слосман, М. Калінін, В. Цішкевіч, К. Казакевіч, С. Мяжэцкая,

час у складзе таварыства налічвалася 26 актыўных сяброў і 34, якія не плацілі складак[220]. Удзельнікі ўхвалілі рашэнне ў наступным сезоне па меры магчымасці больш выступаць у правінцыі[221]. Цэнтральнае праўленне запланавала зладзіць у перыяд з 27 чэрвеня па 4 ліпеня паказы п'ес *Бацькава сэрца* і *Мікітаў лапаць* у Лудзы (27.06), *Пан міністр* у Зілупе (28.06), *Бацькава сэрца* і *Мікітаў лапаць* у Рунданах (29.06), *Мікітаў лапаць* у Шушках (4.07) і *Пан міністр* у Пасіене (6.07)[222]. Аднак 8 чэрвеня было прынята рашэнне абмежавацца трыма паказамі п'есы *Пан міністр* у Зілупе (27.06), Пасіене (28.06) і Рунданах (29.06). З мэтай арганізацыі на месцы ў Латгалію быў камандзіраваны К. Мяжэцкі[223].

Аднак большасць пастановак па-ранейшаму адбывалася ў сталіцы. 7 кастрычніка 1931 г. адбыўся сумесны сход цэнтральнага праўлення БТТЛ, прадстаўнікоў беларускіх арганізацый Рыгі і кіраўнікоў рыжскіх беларускіх школ. Яны абмеркавалі магчымасць удзелу трупы ў аматарскіх выступах у школах. Кіраўнікі школ бралі на сябе абавязак надрукаваць праграмы імпрэз[224]. 7 лістапада 1931 г. намаганнямі "Беларускага народнага тэатра ў Рызе" была пастаўленая камедыя ў дзвюх дзеях *Мікітаў лапаць*, у якой сыгралі: Ян Багдановіч, Антон Доўгі, Станіслаў Гарбачонак, Ян Каяла, Люцыя Тэтар, Вікторыя Доўгая, Анастасія Крэйц, Міхась Калінін, Караль Казакевіч, Ганна Кудрацаўва, Сяргей Кудраўцоў, Казімір Мяжэцкі, Зінаіда Мадзялеўская, Люцыя Тэтар, Ганна Цімафеева, Язэп Камаржынскі і Ян Кудраўцоў[225]. Разам у сезоне 1930/31 гг. трупа паставіла 21 спектакль, які наведала 3 630 гледачоў. У той час рэпертуар рыжскай трупы складаўся з беларускіх п'ес, але былі і пераклады – *Гірт і воўк* Яніса Райніса і *Блудны сын* Р. Блаўмана[226].

У гэты час выросла колькасць аддзелаў БТТЛ. 27 жніўня 1931 г. у цэнтральнае праўленне звярнулася група жыхароў Прыдруйскай воласці з просьбай

У. Гусарэвіч, Ф. Оруб, М. Каяла, Кацярына Карнавухава, Ю. Туманская, Мечыслаў Юркевіч, К. Луцкі, Ян Багдановіч, С. Гарбачонак, Станіслаў Рацын, П. Жэрдзі. LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 35 lp.

[220] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 35–36 lpp.

[221] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 36–37 lpp.

[222] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 40 lp.

[223] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 44 lp.

[224] На мерапрыемстве прысутнічалі: В. Бароўская-Пігулеўская, Я. Камаржынскі, К. Мяжэцкі, Я. Кудраўцоў,– ад БТТЛ, М. Дзямідаў – ад таварыства "Беларуская хата", Я. Кастылюк – ад Рыжскай беларускай дадатковай школы, У. Гусарэвіч – ад ТБМЛ, К. Казакевіч – ад Рыжскай беларускай пры курсах, Д. Чарнуха – ад таварыства "Рунь", У. Пігулеўскі – ад Беларускага аддзела і кааператыва "Культура і праца", С. Сіцько – ад 1-й Рыжскай беларускай школы. LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 53–54 lpp.

[225] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1004 l., 32 lp.; LVVA, 2125 f., 5 apr., 24 l., 5 lp.

[226] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 35–36 lpp.

зарэгістраваць у іх мясцовасці аддзел. І 11 верасня 1931 г. кіраўніцтва таварыства зацвердзіла стварэнне Прыдруйскага аддзела БТТЛ, у склад якога ўвайшлі Э. Вайводзіш (рэвізійная камісія), Ф. Оруб (сакратар), В. Мірановіч (старшыня), М. Талерка (рэвізійная камісія), Мечыслаў Юркевіч (рэвізійная камісія), Ілля Оруб, М. Слосман (намеснік старшыні), Г. Слосман (кандыдат), Т. Багдановіч (кандыдат), Г. Багдановіч, Войцех Багдановіч, В. Караткевіч (кандыдат рэвізійнай камісіі) і А. Заліўскі[227].

У 1932 г. намаганнямі кіраўніцтва БТТЛ было пастаўлена 10 спектакляў, у тым ліку тры прэм'еры: *Пашыліся ў дурні* Марка Крапіўніцкага, *Змагары за ідэю* І. Тагабочнага і *Хлебароб па-амерыканску* Марка Твэна[228]. Напрыклад, 9 красавіка 1932 г., у 5-я ўгодкі існавання беларускага тэатра ў Латвіі, у Рызе паказалі п'есу І. Тагабочнага *Змагары за ідэю*[229]. Варта падкрэсліць, што напярэдадні выступу рэжысёр Ю. дэ Бурс адмовіўся працаваць з трупай. У выніку 5 красавіка цэнтральнае праўленне БТТЛ запрасіла на пасаду рэжысёра Уладзіміра Каценева, артыста рускай драмы, які ўзяўся кіраваць вышэйзгаданай пастаноўкай. Пад яго загадам рыжская трупа прыступіла да пастаноўкі п'есы *Хлебароб па-амерыканску*[230]. У траўні 1932 г. у склад трупы была залічана В. Бароўская-Пігулеўская, якая раней выступала як акампаніятарка, але не належала да калектыву[231].

У 1932 г. да працы ў БТТЛ вярнуўся К. Езавітаў. 20 траўня 1932 г. кіраўніцтва БТТЛ разгледзела яго прапанову выдаць зборнік-альманах з нагоды 5-годдзя існавання тэатра. Цэнтральнае праўленне даручыла гэта камітэту па арганізацыі святкавання. На прапанову Я. Камаржынскага кіраўніцтва арганізацыі прыняло рашэнне ўвесці К. Езавітава ў склад цэнтральнага праўлення "як культурную сілу"[232].

У наступныя гады актыўнасць БТТЛ і рыжскай трупы запаволілася. З прычыны таго, што значная частка сяброў таварыства не змагла наведаць Рыгу ў траўні 1932 г., агульны сход рашэннем кіраўніцтва (28 траўня) быў перанесены на восень[233]. Удалося склікаць яго толькі 1 кастрычніка 1932 г., а ўдзел у ім узяло 14 асоб. Удзельнікі падсумавалі вынікі працы арганізацыі, адзначыўшы, што праз адсутнасць фінансавання былі вымушаны

---

[227] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 47, 58 lpp.

[228] І. Апіня, *На берагах Даўгавы – Дзвіны: Латышска-беларускія ўзаемасувязі* [у:] *Беларусіка= Albarutheniса 6. Беларусь паміж Усходам і Захадам: Праблемы міжнацыянальнага, міжрэлігійнага і міжкультурнага ўзаемадзеяння, дыялогу і сінтэзу*, рэд. У. Конан і інш, Менск 1997, с. 232.

[229] Тэатрал, *Да пяцігодзьдзя Т-ва Беларускага Тэатру ў Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, 1(11), с. 157.

[230] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 69–71 lpp.

[231] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 72 lp.

[232] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 73 lp.

[233] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 76 lp.

адмовіцца ад некаторых пастановак[234]. Адзін з удзельнікаў У. Пігулеўскі адзначыў, што ў сувязі з эканамічным крызісам налета тэатру трэба будзе працаваць у цяжкіх умовах, а сябрам таварыства давядзецца ахвяраваць свой час і сілы. Ён раіў наладзіць шчыльнае супрацоўніцтва з Габрэйскім тэатральным таварыствам "Пэрэц"[235].

У сезоне 1932/33 гг. кіраўніцтва БТТЛ планавала ўвесці ў рэпертуар п'есы *Злодзеі* Р. Блаўмана[236] і *Ружовае павуцінне* Якава Мамантава. Акрамя гэтага ў 1933 г. Планавалі ставіць ранейшыя творы – *Пан міністр*, *Пашыліся ў дурні*, *Змагары за ідэю*, *Авечая крыніца* Лопэ дэ Вега[237]. Рэжысёрамі п'ес былі У. Каценеў і У. Пігулеўскі. Працу тэатру ўскладнялі грашовыя цяжкасці і факт, што сталічная трупа была расцярушаная па трох раёнах – Саркандаўгаве, Маскоўскім Фарштаце і Торэнсбергу. Акторы працавалі ў розныя змены, таму цяжка было вызначыць час на рэпетыцыі, які б задавальняў усіх[238]. Знакавай падзеяй быў удзел – згодна з пастановай управы ад 22 сакавіка 1933 г. – у Тыдні народнай культуры. Артысты паказалі п'есы *Змагары за ідэю* і *Хлебароб па-амерыканску* ў Лудзы, Прыдруі і Зілупе або Індры. Арганізацыяй спектакляў займаўся М. Слосман[239].

22 кастрычніка 1933 г. меўся адбыцца чарговы агульны сход сяброў таварыства з удзелам 11 чал.[240] Аднак праз нешматлікасць прысутных было прынята рашэнне адкласці яго[241]. Другая спроба склікаць сход адбылася 5 лістапада, але з той жа прычыны (прыйшло толькі 8 чал.) ён не адбыўся[242]. Сход удалося правесці толькі 12 лістапада, з удзелам 18 асоб[243]. Ён адбыўся пад старшынствам М. Дзямідава і сакратара М. Слосмана[244]. Удзельнікі падсумавалі вынікі працы таварыства і трупы за год і зрабілі выснову, што, нягледзячы на цяжкія матэрыяльныя і тэхнічныя абставіны, дзякуючы самаахвярнасці людзей, тэатр працаваў няблага[245]. Падчас дыскусіі

---

[234] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 81–82 lpp.

[235] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 85–86 lpp.

[236] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 78 lp.

[237] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 93 lp.

[238] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 106 lp.

[239] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 115 lp.

[240] Гэта былі: В. Бароўская-Пігулеўская, К. Езавітаў, Я. Камаржынскі, У. Пігулеўскі, С. Сіцько, П. Жэрдзі, В. Доўгая, А. Крэйц, Я. Каяла, П. Масальскі.

[241] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 102 lp.

[242] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 103 lp.

[243] Гэта былі: В. Бароўская-Пігулеўская, У. Пігулеўскі, М. Дзямідаў, Я. Камаржынскі, Я. Каяла, М. Слосман, К. Казакевіч, А. Рытаў, Я. Кудраўцоў, А. Крэйц, В. Доўгая, У. Гусарэвіч, С. Сіцько, К. Мяжэцкі, М. Калінін, С. Кудраўцоў, А. Масальскі, Д. Сахараў.

[244] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 104 lp.

[245] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 107 lp.

выказваліся розныя меркаванні наконт таго, як палепшыць тэатр. П. Масальскі прапанаваў ставіць больш беларускіх п'ес, а не перакладаў. Тым часам У. Пігулеўскі лічыў неабходным, каб пастаноўкі праходзілі ў школах, дзе трэба было абсталяваць тэатральныя сцэны[246]. Абранае на сходзе новае кіраўніцтва запрасіла ў тэатр у якасці рэжысёра У. Пігулеўскага, а бутафорам – К. Казакевіча[247].

1934 год пачаўся пастаноўкай п'есы Ф. Аляхновіча *Птушка шчасця* (27 студзеня, у мурах 1-й Рыжскай беларускай школы)[248]. У гэты час беларускі хор зноў атрымаў магчымасць выступіць на Латвійскім радыё. 26 траўня 1934 г. цэнтральнае праўленне таварыства зацвердзіла рэпертуар песняў, які складаўся з наступных твораў: *Ой, з-пад лесу, лесу цёмнага*, *Ой, хадзіў малойчыку*, *Калыханка*, *Кума мая, куманька*[249]. Улетку 1934 г. рыжская тэатральная трупа наведала Пасіене, дзе паставіла п'есу *Пан міністр*. Мерапрыемства адбылося дзякуючы запрашэнню камісіі па ладжанні Дзён асветы[250].

Ускосным сведчаннем актыўнасці БТТЛ з'яўляецца перыядычнасць скліканння паседжанняў цэнтральнай управы арганізацыі. З 3 красавіка 1927 па 15 ліпеня 1936 гг. было праведзена 155 паседжаняў. Аналіз архіўных крыніц дазваляе вызначыць дынаміку сходаў. У падзеле на гады яна выглядае наступным чынам: у 1927 г. – 7, у 1928 г. – 26, у 1929 г. – 19, у 1930 г. – 26, у 1931 г. – 22, у 1932 г. – 16, у 1933 г. – 9, у 1934 г. – 7, у 1935 г. – 6, у 1936 г. – 13. На падставе гэтага можна зрабіць выснову, што найбольш інтэнсіўна праца ішла на мяжы 1920-х і 1930-х гг.

Даўгаўпілс. Незалежна ад рыжскага беларускага тэатральнага актыву адбывалася адпаведная праца ў Даўгаўпілсе. 23 жніўня 1927 г. кіраўніцтва БТТЛ звярнулася да дырэктара Даўгаўпілскай беларускай гімназіі з просьбай стварыць пры школе аддзел таварыства. У звароце адзначалася, што гэта не будзе справай складанай, паколькі ў мурах гімназіі ўжо існавала вучнёўская драматычная дружына. Заахвочваючы даўгаўпілсцаў, кіраўніцтва БТТЛ падкрэслівала, што на працу аддзела будуць прызначаныя асігнаванні, у тым ліку ганарары для вучняў-артыстаў і грошы на арэнду гімназічнай залы. У звароце звярталася ўвага на неабходнасць ладзіць ад імя таварыства пастаноўкі ў Даўгаўпілсе і ў правінцыі яшчэ ў 1927 годзе: "*Каб тая праца, якая да гэтага часу вялася, але не была субсідзіравана Урадам, бо не насіла імя Беларускага Тэатру, а толькі любіцельскіх*

[246] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 108–109 lpp.
[247] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 113 lp.
[248] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 113 lp.
[249] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 117 lp.
[250] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 120 lp.

пастановак, – была цяперака зафіксавана як сталая тэатральная праца беларускай меншасці"[251].

Заклік знайшоў водгук у педагогаў Даўгаўпілскай беларускай гімназіі, якія выказалі жаданне ўступіць у таварыства і стварыць аддзел[252]. На пасяджэнні цэнтральнай управы БТТЛ 1 лістапада 1927 г. у склад арганізацыі былі прынятыя 11 жыхароў Даўгаўпілса (С. Сахараў, І. Фёдараў, У. Раткін, А. Трубецкая, У. Ціхаміраў, П. Жэрдзі, Ю. Панцэвіч, В. Сахарава, В. Матэас, В. Зінкевіч, Г. Цэльяд). На гэтым жа пасяджэнні кіраўніцтва ўхваліла просьбу да Латгальскага акруговага суда зарэгістраваць аддзел БТТЛ у Даўгаўпілсе. Рэгістрацыю даручылі К. Езавітаву[253]. Днём стварэння Даўгаўпілскага аддзела БТТЛ можна лічыць 20 лістапада 1927 г., калі ў памяшканні гімназіі адбыўся першы агульны сход яго сяброў (старшыня С. Сахараў, сакратар А. Сальцэвіч), якому папярэднічала рэгістрацыя (14–20 лістапада)[254]. На сходзе прысутнічалі 13 асоб (К. Александровіч, У. Гусарэвіч, Г. Даўкстэ, Я. Кастылюк, А. Паўлюкевіч, С. Сахараў, В. Сахарава, А. Сальцэвіч, А. Трубецкая, І. Фёдараў, М. Фёдарава, У. Ціхаміраў, Д. Юркевіч). Удзельнікі абралі праўленне аддзелу ў складзе С. Сахарава (старшыня), І. Фёдарава (скарбнік) і А. Сальцэвіча (сакратар). Прысутныя звярнуліся ў цэнтральную ўправу БТТЛ з просьбай асігнаваць 600 латаў на арганізацыю тэатральнай працы ў Даўгаўпілсе і 300 – у Латгаліі. Акрамя таго, кіраўніцтва аддзелу вырашыла запрасіць рэжысёрам тэатральнай трупы Людвіка Мельнікава, кіраўніком хору – Івана Катоўскага, балету – Веру Матэас (яны былі зацверджаны праўленнем аддзела на пасяджэнні 22 лістапада 1927 г.), аркестру – У. Ціхаміра́ва. З мэтай стварэння драматычнага гуртка даўгаўпілсцы прасілі адкамандзіраваць з Рыгі Юраўскага, які, аднак, з невядомых прычын не з'явіўся ў Даўгаўпілсе. Спачатку ў шэрагах аддзела знаходзілася 19 сяброў і 16 кандыдатаў. Кіраўніцтва разлічвала на павелічэнне іх колькасці, таму прасіла даслаць 50 рэгістрацыйных бланкаў[255]. У разгар дзейнасці Даўгаўпілскі аддзел БТТЛ налічваў каля 50 сяброў[256].

На вышэйзгаданым сходзе была сфарміраваная тэатральная трупа, да якой далучыліся К. Александровіч, Д. Юркевіч, У. Ціхаміраў, А. Трубецкая, Я. Кастылюк, А. Сальцэвіч і М. Фёдарава[257]. Лектарам па драматычным

---

[251] LVVA, 1747 f., 1 apr., 25 l., 1 lp.

[252] LVVA, 1747 f., 1 apr., 26 l., 2 lp.

[253] Гэта былі: С. Сахараў, І. Фёдараў, У. Раткін, А. Трубяцкая, У. Ціхаміраў, Г. Цэльят, П. Жэрдзі, Ю. Панцэвіч, В. Сахарава, В. Матэне, В. Зэйгліш. LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 26 lp.

[254] LVVA, 1747 f., 1 apr., 26 l., 4 lp.

[255] LVVA, 1747 f., 1 apr., 26 l., 6 lp.

[256] *З жыцьця Дзьвьнскага Аддзелу Беларускага Тэатру ў Латвіі*, "Наша доля" 1930. № 3 ад 8 сакавіка, с. 4.

[257] LVVA, 1747 f., 1 apr., 21 l., 2 lp.

мастацтве была прызначаная О. Борман, супрацоўніца Даўгаўпілскага латвійскага драматычнага тэатра[258]. На наступны дзень (21 лістапада) адбылося першае пасяджэнне праўлення аддзела, на якім К. Александровічу быў даручаны нагляд за працай трупы. Так ён стаў першым кіраўніком і рэжысёрам даўгаўпілскай тэатральнай групы[259]. Тым часам, І. Фёдараў атрымаў пасаду кіраўніка хору, а А. Сальцэвіч – балету[260].

Амаль адразу пасля арганізацыйнага афармлення Даўгаўпілскі аддзел распачаў тэатральную працу. Першы спектакль адбыўся 26 снежня, артысты паставілі п'есу *На Антокалі*. Мерапрыемства прынесла прыбытак у 64,15 латаў[261]. Наступны спектакль адбыўся 8 і 9 снежня 1928 г., трупа савіла п'есу *Манька*. Першы паказ прайшоў у памяшканні Даўгаўпілскай беларускай гімназіі, а другі – у Грыве[262].

Неўзабаве, аднак, узнік канфлікт паміж цэнтральным праўленнем і кіраўніцтвам Даўгаўпілскага аддзела. Першае аспрэчыла мэтазгоднасць выдаткаў аддзела і крытычна паставілася да першых крокаў даўгаўпілсцаў. У адпаведнасці з пастановай кіраўніцтва БТТЛ ад 3 красавіка 1927 г., памер сяброўскіх гадавых складак для аддзела вызначаўся ў 6 лат, а ўступны ўнёсак – у 5 лат. Палову сяброўскіх складак аддзел мусіў перадаваць у касу цэнтральнага праўлення, а другую палову – пакідаць сабе. Усе ўступныя ўнёскі мусілі трапляць у цэнтральную касу[263]. Аднак досвед паказаў, што Даўгаўпілскі аддзел не заўсёды трымаўся гэтых абавязкаў. На сходзе сяброў аддзела 20 лістапада 1927 г. памер уступнага ўнёску быў вызначаны ў 1 лат, а складкі – у 2 латы. Гэтыя грошы было вырашана пакінуць у Даўгаўпілсе ў сувязі са складаным матэрыяльным становішчам аддзела. Дадзены крок выклікаў абурэнне цэнтральнага праўлення, пра што быў паінфармаваны С. Сахараў падчас візіту ў Рыгу[264]. 13 снежня 1927 г. кіраўніцтва БТТЛ

---

[258] LVVA, 1747 f., 1 apr., 21 l., 5, 8 lpp.

[259] Варта ўвагі, што К. Александровіч не адразу пагадзіўся далучыцца да працы БТТЛ. Дырэктар Даўгаўпілскай беларускай гімназіі наступным чынам адрэагаваў (4 снежня 1927 г.) на яго адмову: "*Вельмі сумна, што свае беларусы адмаўляюцца ад працы без усялякіх прычын*" (LVVA, 1747 f., 1 apr., 25 l., 15 lp.). 4 студзеня 1928 г. праўленне аддзела звярнулася да К. Александровіча з просьбай прадставіць прычыны, пак якіх ён не можа ўзяць удзелу ў працы таварыства. У лісце чытаем: "*Наогул Ваш крок дужа незразумелы і нечаканы ад Вас, як ад беларуса, у самым пачатку працы нашае арганізацыі. Праўленне мае надзею, што гр. Александровіч, дасцё тлумачэнне і знайдзеце магчымым прыняць актыўны ўдзел у працы т-ва*" (LVVA, 1747 f., 1 apr., 26 l., 18 lp.). Пазней аднак К. Александровіч далучыўся да працы Даўгаўпілскага аддзела, стаўшы адным з самых актыўных яго ўдзельнікаў.

[260] LVVA, 1747 f., 1 apr., 21 l., 2 lp.

[261] LVVA, 1747 f., 1 apr., 21 l., 3, 5 lpp.

[262] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 99 lp.

[263] LVVA, 1747 f., 1 apr., 25 l., 11 lp.

[264] LVVA, 1747 f., 1 apr., 21 l., 4 lp.

разгледзела бюджэт Даўгаўпілскага аддзела і выкрасліла з яго частку запланаваных выдаткаў[265].

4 студзеня 1928 г. кіраўніцтва Даўгаўпілскага аддзела аспрэчыла гэтае рашэнне, палічыўшчы яго несправядлівым і абгрунтаваўшы сваю пазіцыю тым, што на Даўгаўпілшчыне жыве асноўная колькасць латвійскіх беларусаў, якія патрабуюць культурнай апекі. У пратаколе пасяджэння аддзела адзначалася, што "*калі Асяродкавае праўленне лічыць, што Дзвінскі аддзел існуе не для фармальнасцей, а для працы, то яно павінна даасігнаваць яму 20 латаў, аб чым аддзел яшчэ раз упарта просіць і прэтэндуе на гэтыя грошы як на пашырэнне сваёй працы, так і на аплату рэжысёра*"[266].

Не дачакаўшыся грашовай дапамогі ад цэнтральнага праўлення, яшчэ 14 снежня 1927 г. даўгаўпілшчане скіравалі ліст у БША, інфармуючы пра стварэнне аддзела і адзначыўшы, што ён "*жадае развярнуць шырока тэатральную працу шляхам арганізацыі тэатральных пастановак і беларускага хору, галоўным чынам, на вёсцы*". Аўтары прасілі выдаткаваць сродкі на працу аддзела, паколькі "*Дзвінск з'яўляецца безумоўным беларускім цэнтрам у Латгаліі і блізка стаіць да гушчы беларускага сялянства*"[267].

Не атрымаўшы грошай з Рыгі, кіраўніцтва Даўгаўпілскага аддзела 15 лютага 1928 г. склала свае абавязкі[268]. 19 лютага 1928 г. цэнтральнае праўленне занялося гэтай справай. У пратаколе пасяджэння кіраўніцтва БТТЛ чытаем, што яно "змушана катэгарычна пратэставаць проці недапушчальнага ў грамадскай працы тону" Даўгаўпілскага аддзела. Гаворка ішла пра тое, што даўгаўпілсцы патрабавалі грошай на аплату лектараў не даючы справаздачы пра папярэднюю дапамогу. Апрача таго, кіраўніцтва таварыства дакарала Даўгаўпілскі аддзел за тое, што ён даслаў абвестку пра адкрыцці тэатра ў Даўгаўпілсе, якая была "выдрукавана страшэнна непісьменна"[269]. Кіраўніцтву БТТЛ не спадабалася, што заняткі для артыстаў, як адзначалася ў абвестцы і афішах, будуць ісці на рускай мове – бо гэты крок "можа нашкодзіць нацыянальнай рэпутацыі"[270].

14 кастрычніка 1928 г. адбыўся чарговы агульны сход сяброў аддзела, на якім быў абраны новы склад праўлення: А. Барткевіч (старшыня), І. Фёдараў (скарбнік), А. Трубецкая (сакратар)[271]. Удзельнікі ўхвалілі зварот у цэнтральнае праўленне з просьбай выдаткаваць 500 латаў на разгортванне

---

[265] LVVA, 1747 f., 1 apr., 26 l., 17 lp.
[266] LVVA, 1747 f., 1 apr., 26 l., 22 lp.
[267] LVVA, 1747 f., 1 apr., 26 l., 9 lp.
[268] LVVA, 1747 f., 1 apr., 26 l., 27 lp.
[269] LVVA, 1747 f., 1 apr., 26 l., 19 lp.
[270] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 37 lp.
[271] LVVA, 1747 f., 1 apr., 26 l., 38 lp.; LVVA, 1747 f., 1 apr., 21 l., 5 lp.

тэатральнай працы, якая прадугледжвала: паказ 9 спектакляў у Даўгаўпілскім павеце і 4 – у Лудзенскім (частку п'ес належала перакласці з латышскай і рускай моў); арганізацыю пры аддзеле беларускага хору; арганізацыю цыклу лекцый па тэатральным мастацтве; набыццё грыму і іншага інвентару[272]. 11 лістапада 1928 г. Даўгаўпілскі аддзел прасіў цэнтральную ўправу дадаткова вылучыць 250 латаў, у тым ліку 120 – на паўгадавы заробак рэжысёра (па 20 латаў у месяц), 60 латаў – на рэкламу (па 10 латаў у месяц) і 70 латаў – на пераклады[273]. Каб палепшыць матэрыяльнае становішча найбольш актыўных сяброў, кіраўніцтва аддзела (9 красавіка 1929 г.) вызваліла іх ад штомесячных складак, а таксама на прапанову П. Масальскага прыняло рашэнне зладзіць 2 чэрвеня грашовую латарэю на 220 латаў. Таксама падчас канферэнцыі беларускіх арганізацый Латвіі было сабрана 42 латы ахвяраванняў, каб кампенсаваць выдаткі на пастаноўку п'есы *Апошняе спатканне*[274].

Такім чынам, праўленне аддзела не здолела вырашыць праблем, звязаных з недафінансаваннем. Больш за тое, працягваліся непаразуменні з цэнтральным кіраўніцтвам БТТЛ. На думку апошняга, даўгаўпілсцы затрымлівалі справаздачы пра выкарыстанне сродкаў, атрыманых з урадавых крыніц[275]. У лістападзе 1929 г. старшыня БТТЛ В. Бароўская-Пігулеўская звярнулася да С. Сахарава з просьбай паспрыяць атрыманню неабходнай дакументацыі, паколькі кіраўнік Даўгаўпілскага аддзела А. Барткевіч не рэагаваў на яе просьбы[276].

1 лістапада 1929 г. на агульным сходзе сяброў аддзела (старшыня А. Райко, сакратар У. Ціхаміраў) быў абраны новы склад праўлення: А. Райко (старшыня), У. Ціхаміраў (скарбнік) і К. Александровіч (сакратар)[277]. Удзельнікі схода палічылі працу папярэдняга праўленне на чале з А. Барткевічам нездавальняючай праз яго малаактыўнасць. Прысутныя адкінулі прапанову А. Барткевіча выключыць са складу таварыства К. Александровіча[278]. Новае праўленне 21 лістапада 1929 г. абрала мастацкую калегію ў складзе М. Каспяровіч, С. Сахарава, А. Абулевіча і кандыдатаў У. Якубоўскага, І. Фёдарава і С. Краўчанкі[279]. 19 снежня 1929 г. была абраная рэвізійная

---

[272] LVVA, 1747 f., 1 apr., 26 l., 37 lp.

[273] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 87 lp.

[274] LVVA, 1747 f., 1 apr., 21 l., 11 lp.

[275] LVVA, 1747 f., 1 apr., 25 l., 39 lp.

[276] LVVA, 1747 f., 1 apr., 25 l., 33 lp.

[277] LVVA, 1747 f., 1 apr., 25 l., 49 lp. У сувязі з адпачынкам К. Александровіча ў перыяд з ліпеня па верасень 1930 г. абавязкі сакратара выконвала М. Каспяровіч. LVVA, 1747 f., 1 apr., 21 l., 31 lp.

[278] LVVA, 1747 f., 1 apr., 21 l., 12 lp.

[279] LVVA, 1747 f., 1 apr., 21 l., 19 lp.

камісія: С. Сахараў, І. Фёдараў, Уладзімір Якубоўскі і кандыдаты П. Гладкова і М. Фёдарава[280].

З прыходам новага кіраўніцтва грашовыя і арганізацыйныя клопаты Даўгаўпілскага аддзела не скончыліся. 30 снежня 1929 г. рэвізійная камісія БТТЛ выявіла нястачу ў касе аддзела грошай, якія фігуравалі ў касавай кнізе[281]. 20 лютага 1930 г. цэнтральнае праўленне ў катэгарычнай форме запатрабавала ад кіраўніцтва Даўгаўпілскага аддзела неадкладна даць фінансавую справаздачу, паколькі ў адваротным выпадку яму пагражала ліквідацыя[282]. 11 снежня 1930 г., пасля праверкі фінансаў аддзела рэвізійнай камісіяй (С. Сахараў, І. Фёдараў) была зроблена выснова, што «*праўленне т-ва 'Беларускі Тэатр' Дзвінскі аддзел павярхова адносіўся да грашовых спраў як урадавых, так і дабытых т-вам ад пастановак спектакляў. У будучыні так весці грашовыя справы, гэта значыць заведама губіць самую справу як тэатральную, так і ўсю наогул беларускую справу*"[283]. 14 снежня 1930 г. падчас чарговага схода сяброў (16 чал.) было сфарміраванае новае праўленне аддзела: К. Александровіч (старшыня), Антон Абалевіч (сакратар) і У. Ціхамірaў (скарбнік)[284].

У атмасферы такіх непаразуменняў ішла праца даўгаўпілскай тэатральнай трупы, рэжысёрамі якой у разгляданы перыяд былі К. Александровіч і Станіслаў Мельнікаў [285]. Апошняга прынялі на пасаду рэжысёра пасля таго, як у верасні 1930 г. прапанову працы не прыняў Якаў Качубаеў[286]. У сезоне 1929/30 гг. даўгаўпілскія артысты паставілі ў Даўгаўпілсе шэраг п'ес: *Жанімства па радыё* (3 разы), *Шчаслівы муж*, *Сватанне*, *Чорт і баба* (2 разы) *Мікітаў лапаць*, *Калісь*, *Атрута*, *Дзядзька Якуб*, *Птушка шчасця*, *Пісаравы імяніны*, *Пашыліся ў дурні* (два разы), *Пасланец*, *Манька*, *Апошняе спатканне*, *Збянтэжаны Саўка*, *На вёсцы*, *Міхалка*, *Два жаніхі*, *Модны шляхцюк*[287]. На прапанову К. Александровіча 17 снежня 1930 г. кіраўніцтва вырашыла пачаць новы сезон з рэпетыцыі п'ес *Боты*, *Птушка шчасця* і *Дзядзька Якуб*[288].

Спачатку рэпертуар даўгаўпілскай трупы складаўся з п'ес *Два жаніхі*, *Манька*, *Мікітаў лапаць*, *Апошняе спатканне* і *Калісь*. З цягам часу ён

---

[280] LVVA, 1747 f., 1 apr., 26 l., 51 lp.

[281] LVVA, 1747 f., 1 apr., 25 l., 45 lp.

[282] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 160 lp.

[283] LVVA, 1747 f., 1 apr., 25 l., 69 lp.

[284] LVVA, 1747 f., 1 apr., 28 l., 64 lp.; LVVA, 1747 f., 1 apr., 21 l., 34–35 lpp.; LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 17 lp.

[285] *З жыцьця Дзьвінскага Аддзелу Беларускага Тэатру ў Латвіі*, "Наша доля" 1930. № 3 ад 8 сакавіка, с. 4.

[286] LVVA, 1747 f., 1 apr., 21 l., 25 lp.; LVVA, 1747 f., 1 apr., 21 l., 28, 70lpp.

[287] LVVA, 1747 f., 1 apr., 21 l., 33 lp.; LVVA, 1747 f., 1 apr., 26 l., 57 lp.

[288] LVVA, 1747 f., 1 apr., 21 l., 35 lp.

пашыраўся. У 1927–1931 гг. акторы развучылі тэксты 23 п'ес (*На Антокалі*, *Манька*, *На вёсцы*, *Сватанне*, *Зьбянтэжаны Саўка*, *Калісь*, *Пашыліся з дурні*, *Шчаслівы муж*, *Апошняе спатканне*, *Модны шляхцюк*, *Лекары і лекі*, *Як яны жаніліся*, *Мікітаў лапаць*, *Боты*, *Чорт і баба*, *Жанімства па радыё*, *На Полацкім замчышчы*, *Птушка шчасця*, *Міхалка*, *Пасланец*, *Здрада*, *Дзядзька Якуб*, *Змагары за ідэю* (*Каін і Авель*) і інш.). Найбольш плённым на пастаноўкі быў 1930 год, калі даўгаўпілская трупа паставіла 12 спектакляў, з якіх 5 адбыліся ў гімназіі. Пасля спектакляў звычайна спяваў хор, былі дэкламацыі, балетныя выступы, ігралі баяністы. Некаторыя спектаклі ладзіліся ў межах святкавання Дзён беларускай культуры. Восенню 1930 г. Рада беларускіх арганізацый Даўгаўпілшчыны папрасіла Даўгаўпілскі аддзел БТТЛ падрыхтаваць да дня Янкі Купалы пастаноўку *Паўлінка* і выступ хору[289]. Пэўная частка выступаў адбылася супольна з дырэкцыяй Даўгаўпілскай беларускай гімназіі. На просьбу кіраўніцтва гімназіі Даўгаўпілскі аддзел БТТЛ паставіў у школе 1 сакавіка 1929 г. п'есы *Птушка шчасця* і *Чорт і баба*. Пастаноўкі былі часткай вечарыны на карысць бедных вучняў[290]. 3 траўня 1930 г. артысты на просьбу кіраўніцтва гімназіі ўзялі ўдзел у вечарыне на карысць бедных вучняў і сыгралі п'есу *Шчаслівы муж*[291], а 25 красавіка 1931 г. хор выканаў беларускія народныя песні[292].

У Даўгаўпілскі аддзел звярталіся прадстаўнікі розных арганізацый і ўстаноў з просьбамі зладзіць тэатральныя выступы. Напрыклад, 20 студзеня 1930 г. кіраўніцтва аддзела задаволіла просьбу царкоўнай рады вёскі Шкельтава паставіць там дзве п'есы, у тым ліку *Зьбянтэжаны Саўка*[293]. Трупа выступала і ў межах вечарын, якія ладзілі таварыствы "Беларуская хата" (лістапад 1930 г.: *Мікітаў лапаць* і *Пакой у наймы*) і "Араты" (чэрвень 1930 г. *Жанімства па радыё*)[294]. Тым часам адзін з аддзелаў таварыства "Араты" прасіў зладзіць у Даўгаўпілсе 8 чэрвеня 1930 г. тэатральную вечарыну. Выдаткі, звязаныя з арганізацыяй мерапрыемства, таварыства "Араты" брала на сябе[295].

Нягледзячы на дадзеныя вынікі, С. Сахараў падкрэсліваў неабходнасць шырэйшае працы ў вёсках. 13 чэрвеня 1930 г. кіраўніцтва аддзела зацвердзіла летні план, які прадугледжваў пастаноўкі ў Індры, Пустыне, Бораўцы і Пасіене[296]. На пасяджэнні праўлення аддзелаў 8 ліпеня было пастаўлена пытанне пра спектаклі ў Тартаках, Каплаве (*Модны шляхцюк*, *Чорт і баба*)

[289] LVVA, 1747 f., 1 apr., 21 l., 29 lp.
[290] LVVA, 1747 f., 1 apr., 25 l., 48 lp.
[291] LVVA, 1747 f., 1 apr., 25 l., 51 lp.
[292] LVVA, 1747 f., 1 apr., 28 l., 49 lp.
[293] LVVA, 1747 f., 1 apr., 21 l., 18 lp.
[294] LVVA, 1747 f., 1 apr., 27 l., 5 lp.; LVVA, 1747 f., 1 apr., 25 l., 52, 56 lpp.
[295] LVVA, 1747 f., 1 apr., 25 l., 53 lp.
[296] LVVA, 1747 f., 1 apr., 21 l., 28 lp.

і Прыдруйску (*Шчаслівы муж*)[297]. Чатыры разы ставілі п'есы на Ілукшчыне (у 1928 г. у Скрудаліене – *На вёсцы* і *Манька*, у 1931 г. у Свентах – *Мікітаў лапаць* і *Пасланец*)[298]. Спектаклі ладзіліся ў мурах пачатковых школ або ў вясковых клубах. Прыбытак ад пастановак прызначаўся на патрэбы таварыства і дапамогу мясцовай беларускай супольнасці. Напрыклад, у вёсцы Шкельтава (Даўгаўпілскі павет) артысты паказалі п'есы *Пасланец* і *Чорт і баба*, а зароблены грошы аддалі на рамонт мясцовай царквы[299].

Трэба адзначыць, што Даўгаўпілскі аддзел меў абавязак дасылаць у цэнтральнае праўленне па некалькі асобнікаў афішы кожнай пастаноўкі як доказ сваёй дзейнасці. Гэтыя матэрыялы потым падаваліся Культурнаму фонду Латвіі, Міністэрству асветы і іншым установам, якія дафінансоўвалі працу тэатра[300].

Разам у 1927–1931 гг. было зладжана 36 пастановак. Улетку 1931 г. даўгаўпілская трупа налічвала 15 чал. Самымі дзейнымі акторамі былі К. Александровіч, Антон Абалевіч, У. Ціхаміраў, Марыя Каспяровіч, Таццяна Гладкова, С. Райко, С. Мельнікаў і Кацярына Карнавухава. У 1932 г. колькасць артыстаў выросла да 24[301].

Адной з заганаў даўгаўпілскай трупы быў недахоп сцэнічных касцюмаў[302]. У красавіку 1931 г. артысты выступілі ў Краславе, дзе ставілі *Мікітаў лапаць* і *Боты*. У справаздачы У. Ціхаміраў адзначалася, што вечарына прайшла добра, але можна было лепш падабраць сцэнічныя ўборы[303]. 20 ліпеня 1931 г., рыхтуючы каштарыс на бягучы сезон, праўленне аддзела адзначала, што трупа не мае ўласных касцюмаў і шафы на гардэроб. Кіраўніцтва падкрэслівала

---

[297] LVVA, 1747 f., 1 apr., 21 l., 29 lp.

[298] LVVA, 1747 f., 1 apr., 27 l., 50 lp.

[299] LCVA, f. 368, ap. 1, b. 34, l. 6.

[300] LVVA, 1747 f., 1 apr., 25 l., 1 lp.

[301] У той час у склад трупы ўваходзілі: Канстанцін Александровіч, 1890 г.н. (з 1927), Алесь Сальцэвіч, 1906 г.н., (з 1927), Уладзімір Ціхаміраў, 1896 г.н. (з 1927), Сцяпан Краўчанка, 1909 г.н. (з 1927), Ілля Фёдараў (з 1927), Марыя Фёдарава, 1901 г.н. (з 1927), Аляксандра Трубецкая, 1905 г.н. (з 1927), Сяргей Сахараў (з 1927 г. быў "сябрам тэатру"), Антон Абулевіч, 1904 г.н. (з 1928), Станіслаў Мельнікаў, 1890 г.н. (з 1928), Марыя Каспяровіч, 1902 г.н. (з 1928), Станіслава Райко, 1895 г.н. (з 1928), Таццяна Гладкова, 1908 г.н. (з 1928), Аляксандр Чарніховіч, 1907 г.н. (з 1930) Паўліна Квачова, (з 1930), Марыя Міхайлоўская, 1901 г.н. (з 1930), Сымон Маціеўскі, 1889 г.н. (з 1931), Міхаіл Макаруха, 1909 г.н. (з 1931), Люцыя Александровіч, 1900 г.н. (з 1931), Вячаслаў Няміра, 1906 г.н. (з 1931), Кацярына Ганчарова (з 1931), Эфара Натайла, 1913 г.н. (з 1931), Вольга Максімава. LVVA, 1747 f., 1 apr., 27 l., 33, 43 lpp.

[302] На пасяджэнні праўлення 29 лістапада 1931 г. У. Ціхаміраў крытычна ацэньваў вопратку актораў, якія паставілі *Як яны жаніліся* і *На вёсцы*. Акрамя таго, ён звяртаў увагу на шэраг памылак у выступе актораў падчас пастаноўкі *На вёсцы* і *Дзядзька Якуб*, якія заўважыла публіка і рэагавала смехам. LVVA, 1747 f., 1 apr., 21 l., 45 lp.

[303] LVVA, 1747 f., 1 apr., 21 l., 39 lp.

вострую нястачу дэкарацый у нацыянальным стылі (нацыянальныя строі), якія адсутнічалі ў Даўгаўпілсе. У сезоне 1929/30 гг. аддзел прасіў кіраўніцтва прызначыць 5 тыс. латаў на вышэйзгаданыя выдаткі, але атрымаў толькі 650[304]. З цягам часу Даўгаўпілскі аддзел набыў дробную нерухомасць: шафу на касцюмы, валізкі, грым, сцэнічныя ўборы для артыстаў. На прапанову У. Ціхаміравa праўленне аддзела набыло тры парыкі, паколькі артысты бралі іх у пракат, што дорага каштавала[305]. Тым не менш, у гардэробе не хапала некаторых рэчаў, якія даўгаўпілсцы пазычылі ў сваіх рыжскіх калег. 28 чэрвеня 1932 г. кіраўніцтва аддзела прасіла цэнтральнае праўленне даслаць касцюмы ксяндза, беларуска-літоўскага караля і маскоўскага цара Васіля[306]. Акрамя таго, кіраўніцтва БТТЛ звярталася да Даўгаўпілскай беларускай гімназіі з прапановай пашыць касцюмы для артыстаў[307].

Якасць тэатральных выступаў ацэньвалася па-рознаму. Крытычна адгукнуўся на спектакль аўтар зацемкі, змешчанай на старонках газеты "Наша доля". Ён лічыў, што даўгаўпілскаму калектыву неабходна было ўздымаць прафесійны ўзровень, а таксама пашырыць сваю працу на вёскі. У публікацыі чытаем: "*Пастаноўкі трэба рабіць не там, куды просяць і добра кормяць, а там, дзе яны сапраўды неабходны*"[308]. На адным з пасяджэнняў кіраўніцтва аддзела У. Ціхаміраў звярнуў увагу на мастацкія складанасці, з якімі сутыкаецца трупа ў часе вясковых пастановак, часта не дасягаючы сваіх мэтаў. Ён сцвярджаў, што "*вёска не абарудавана да добрых пастановак. На вёсцы няма падхадзячага памяшкання да пастановак, няма святла, а таму сур'ёзнай добрай пастаноўкі на вёсцы паставіць няможна была акрамя лёгкіх жарцікаў далеча ад настрою грамады і запатрабавання. З малымі пастаноўкамі мы не дасягаем мэты тэатра. Грамада халадзее да тэатра, не бачачы сур'ёзных пастановак. Ставячы малыя жарцікі, дзе грамада паглядзела як гэта кажуць, адпачыла крышку і забыла гэту пастаноўку на заўтрашні дзень. Мы як беларусы робім у большым працэнце справу нацыянальную, а не мастацкую, а тэатр павінен служыць мастацтву*"[309]. Аднак старшыня аддзела лічыў выезды на вёску з пастаноўкамі неабходным, паколькі "*беларускія арганізацыі, знаходзячыя ў месце, рэдка адведваюць вёску, а арганізацыі і персоны іншых нацыянальнасцяў (...) аслабляюць нацыянальнае чуццё беларусаў*"[310].

---

[304] LVVA, 1747 f., 1 apr., 21 l., 40 lp.

[305] LVVA, 1747 f., 1 apr., 22 l., 12 lp.

[306] LVVA, 1747 f., 1 apr., 22 l., 6 lp.

[307] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 185 lp.

[308] *З жыцьця Дзвьнскага Аддзелу Беларускага Тэатру ў Латвіі*, "Наша доля" 1930. № 3 ад 8 сакавіка, с. 4.

[309] LVVA, 1747 f., 1 apr., 22 l., 4 lp.

[310] LVVA, 1747 f., 1 apr., 22 l., 5 lp.

Пэўнай цяжкасцю ў працы даўгаўпілскага тэатра была адсутнасць уласнай залы для рэпетыцый. У асноўным яны адбываліся ў зале Даўгаўпілскай беларускай гімназіі, якая здавала БТТЛ памяшканне ў арэнду за аплату асвятлення[311]. Яшчэ 8 лістапада 1929 г. кіраўніцтва Даўгаўпілскага аддзела звярнулася ў школьную раду гімназіі па дазвол праводзіць у школе пасяджэнні праўлення і рэпетыцыі п'ес[312]. Са згоды кіраўніцтва школы рэпетыцыі адбываліся пасля заняткаў у памяшканні ткацкай майстэрні. З ліста (16 снежня 1929 г.) кіраўніцтва аддзела ў школьную раду гімназіі вынікала, што падчас адной з рэпетыцый адбылося непаразуменне з удзелам артыстаў і інструктаркі майстэрні, якая "абразіла т-ва, адмовіўшы ім памяшкання, заявіўшы, што майстэрня занята хорам, у якім яна спявае". У выніку на сходзе сяброў Даўгаўпілскага аддзела 13 снежня было прынята рашэнне лічыць "паступак гр. А. Трубецкай некарэктным і абражаючым нацыянальнае пачуццё сябраў Т-ва"[313]. Не заўсёды гімназія была ў стане даць артыстам залу, паколькі вучні ладзілі ўласныя вечарыны (выпускныя і інш.)[314]. У сувязі з тым, што на пачатку 1930-х гг. над гэтай установай навісла пагроза ліквідацыі, трупа была вымушана шукаць новае памяшканне. 30 верасня 1932 г. кіраўніцтва аддзела вырашыла перанесці інвентар трупы з гімназіі ў беларускую пачатковую школу[315].

Не захавалася шмат звестак наконт дысцыпліны артыстаў. Аналізуючы нешматлікія згадкі, можна зрабіць выснову, што паводзіны некаторых з іх не заўсёды былі належнымі. 3 студзеня 1931 г. кіраўніцтва аддзела зрабіла заўвагу А. Райко палічыўшы яго ўчынак "нетактоўным", паколькі ён затрымаў рэпетыцыю, адмаўляючыся ад выезду з пастаноўкай у Пустын[316].

На якасці спектакляў адбіваўся і той факт, што трупа не мела сталага рэжысёра і складу. Частка беларускага актыву ўсведамляла, што яе трэба перафарміраваць у прафесійную драматычную дружыну. У сувязі з гэтым кіраўніцтва БТТЛ дэлегавала свайго прадстаўніка М. Краўчанку на пасяджэнне Рады беларускіх арганізацый, якая адбылася 25 студзеня 1930 г. у Даўгаўпілсе. Прадстаўнік БТТЛ прадставіў на з'ездзе даклад пра дзейнасць таварыства. Пасля яго выступу з'езд прыняў рэзалюцыю, абвясціўшы пра намер стварыць сталую тэатральную трупу і прасіць урад пра матэрыяльную дапамогу тэатру[317]. Кіраўніцтва лічыла, што павысіць узровень

---

311 LVVA, 1747 f., 1 apr., 25 l., 36 lp.
312 LVVA, 1747 f., 1 apr., 25 l., 44 lp.
313 LVVA, 1747 f., 1 apr., 26 l., 55 lp.
314 LVVA, 1747 f., 1 apr., 25 l., 29 lp.
315 LVVA, 1747 f., 1 apr., 22 l., 7 lp.
316 LVVA, 1747 f., 1 apr., 21 l., 37 lp.
317 LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 149–151 lpp.

тэатральнага майстэрства трупы можа дапамога віленскіх і менскіх дзеячаў. 17 ліпеня 1930 г. кіраўніцтва аддзела выказала жаданне выпісаць з Менска і Вільні па адным асобніку п'ес[318]. На гэтым жа пасяджэнні было ўхвалена рашэнне арганізаваць у Даўгаўпілсе (з 5 жніўня 1930 г.) курс лекцый па беларускім мастацтве, які б ахопліваў наступныя тэмы: 1) гісторыя беларускай літаратуры, звяртаючы асаблівую ўвагу на біяграфіі беларускіх драматургаў; 2) гісторыя беларускага тэатра. У якасці лектараў планавалі запрасіць К. Езавітава, Б. Тарашкевіча і С. Рак-Міхайлоўскага. У сувязі з гэтым кіраўніцтва аддзелу звярнулася ў цэнтральнае праўленне з просьбай парупіцца пра дазвол Міністэрства асветы[319].

З цяжкасцямі сутыкаўся і хор аддзела, які канчаткова аформіўся толькі ўлетку 1930 г. 13 чэрвеня кіраўніцтва аддзелу звярнулася да цэнтральнага праўлення па грашовую дапамогу на стварэнне хору, прапануючы сфарміраваць яго не пазней за 16 ліпеня, а кіраўніком прызначыць Я. Катоўскага[320]. У жніўні 1930 г. кіраўніцтва аддзела прыняло рашэнне ўзмацніць дысцыпліну харыстаў, паколькі "неакуратна ў апошнім часе адбываюцца спеўкі". Кіраўніцтва аддзела даручыла У. Ціхаміраву пісьмова інфармаваць харыстаў пра рэпетыцыі і рупіцца, каб яны іх наведвалі[321].

Кіраўніцтва Даўгаўпілскага аддзела лічыла, што трупа і хор маглі б працаваць лепш, калі б не абыякавае стаўленне цэнтральнага кіраўніцтва БТТЛ. Кіраўніцтва аддзела лічыла, што Рыга ігнаруе патрэбы даўгаўпілскіх артыстаў і заклікала надаваць большую ўвагу не сталіцы, а працы ў Латгаліі і на Ілукшчыне. Следам ішла просьба да цэнтральнага праўлення як мага хутчэй выслаць грошы[322]. Аўтары машынапісу *Маленькі нарыс працы тэатральнага т-ва Дзвінскага аддзела з пачатку заснавання да сучаснага моманту* (Даўгаўпілс 1931 г.) выказвалі думку, што цэнтральнае праўленне не звяртала належнай увагі на Даўгаўпілс і выключна само карысталася ўрадавай дапамогай[323]. Мясцовыя тэатралы засыпалі беларускія ўстановы ў Рызе з просьбай падтрымаць даўгаўпілскую трупу. Напрыклад, 18 сакавіка 1930 г. Рада беларускіх арганізацый Даўгаўпілса прасіла БША вылучыць дадатковыя сродкі даўгаўпілскім акцёрам, якія больш за год працавалі без матэрыяльнай падтрымкі[324].

У ліпені 1931 г. кіраўніцтва аддзела скардзілася цэнтральнаму праўленню, што не стае грошай на ўтрыманне рэжысёра – "цэнтраля" прызначыла на

---

[318] LVVA, 1747 f., 1 apr., 21 l., 31 lp.
[319] LVVA, 1747 f., 1 apr., 21 l., 31 lp.
[320] LVVA, 1747 f., 1 apr., 21 l., 28 lp.
[321] LVVA, 1747 f., 1 apr., 21 l., 25 lp.
[322] LVVA, 1747 f., 1 apr., 21 l., 40 lp.
[323] LVVA, 1747 f., 1 apr., 27 l., 43 lp.
[324] LVVA, 2125 f., 5 ap., 86 l., 17 lp.

яго аплату мінімальную суму ў памеры 60 латаў у месяц. У лісце падкрэслівалася, што праз нястачу сродкаў даўгаўпілскія акторы не мелі ніводнага касцюма, якія складана было ў горадзе ўзяць напракат (напрыклад, беларускі народны строй і дэкарацыі ў народным стылі). У дакуменце звярталася ўвага, што няма грошай на пераклады іншамоўных п'ес, на шафу і на лекцыі па драматычным майстэрстве. Аўтары звароту адзначалі, што цяжар тэатральнай дзейнасці павінен быць перанесены з Рыгі ў Латгалію і Ілукшчыну, а таму Даўгаўпілскаму аддзелу трэба большая фінансавая падтрымка[325]. Крытычны погляд на палітыку цэнтральнага кіраўніцтва БТТЛ у дачыненні да Даўгаўпілскага аддзела падзяляў яго кіраўнік К. Александровіч. Апошні сцвярджаў, што за час яго кіравання аддзелам (1930/31 гг.) даўгаўпілская трупа паказала 17 п'ес (у тым ліку тры – на выездзе), з якіх 13 сыгралі з мэтай дапамогі школам. Адначасова ён падкрэсліваў, што даўгаўпілсцы маглі б зрабіць больш, але цэнтральнае праўленне "не дало сродкаў". Актыў Даўгаўпілскага аддзела заклікаў цэнтральнае кіраўніцтва БТТЛ выдаткоўваць на патрэбы трупы не менш як палову сродкаў атрыманых ад урада і Культурнага фонду Латвіі[326].

Нягледзячы на праблемы, Даўгаўпілскі аддзел і трупа працягвалі працаваць. Была створана бібліятэка, якая налічвала 110 выданняў[327]. У 1932 г. было абрана новае праўленне ў наступным складзе: У. Ціхамірaў (скарбнік), А. Абалевіч (сакратар), С. Маціеўскі (старшыня)[328]. Са студзеня 1932 г. новым рэжысёрам даўгаўпілскай трупы стаў У. Ціхамірaў. Пад яго кіраўніцтвам (па стане на красавік 1934 г.) працавалі 24 артысты[329]. Яны ўзялі ўдзел у падрыхтоўцы да святкавання 5-й гадавіны існавання беларускага тэатра ў Латвіі. З гэтай мэтай Даўгаўпілскі аддзел падрыхтаваў вышэйзгаданы *Маленькі нарыс працы тэатральнага т-ва Дзвінскага аддзела з пачатку заснавання да сучаснага моманту*, а 28 чэрвеня 1932 г. праўленне аддзела звярнулася ў кіраўніцтва БТТЛ з прапановай размясціць здымкі даўгаўпілскай трупы ў тэатральным альманаху, які тады планавалі выдаць рыжане[330]. У кастрычніку 1932 г. Даўгаўпілскі аддзел вырашыў, што з прычыны адсутнасці

---

[325] LVVA, 1747 f., 1 apr., 27 l., 24 lp.

[326] LVVA, 1747 f., 1 apr., 21 l., 51 lp.

[327] LVVA, 1747 f., 1 apr., 21 l., 46 lp.

[328] LVVA, 1747 f., 1 apr., 22 l., 1 lp.

[329] Вядома, што ў склад трупы ў гэты час уваходзілі: К. Александровіч, У. Ціхамірaў, І. Фёдараў, Мікола Каспяровіч, С. Саўкант, Антон Абалевіч, Тацяна Гладкова, Ал. Райко, Станіслаў Райко, К. Шафрановіч, Міхаіл Каспяровіч, С. Маціеўскі, Зінаіда Мадзялеўская, Вольга Максімава, Кацярына Карнавухава, Аляксандр Чарніховіч, Міхаіл Макаруха, Мікалай Максімаў, П. Пырсікаў, К. Лазоўскі, Сцяпан Краўчанка, Эдуард Наталко, Аляксанр Казачонак. LVVA, 1747 f., 1 apr., 27 l., 66 lp.; LVVA, 1747 f., 1 apr., 29 l., 51 lp.

[330] LVVA, 1747 f., 1 apr., 22 l., 6 lp.

сродкаў святкаванне юбілею будзе сціплым[331]. У выніку 8 студзеня 1933 г. артысты паставілі ў гімназіі п'есу *На Антокалі*, а У. Ціхаміраў прачытаў даклад аб 5-годдзі і гэтым самым адсвяткавалі юбілей[332].

Працягвала трупа і гастролі па правінцыі, што таксама патрабавала сродкаў. 12 красавіка 1932 г. кіраўніцтва аддзела звярнулася ў цэнтральнае праўленне з просьбай асігнаваць "больш значную суму" на паездкі ў вёскі з пастаноўкамі ў летні час "таму, што жывая сувязь паміж вёскай і горадам замёрла, а без гэтай сувязі адміраць пачынае з двух канцоў, г.зн. з вяршыні і з карэнняў"[333]. Пастаноўкі ў правінцыі ладзіліся на просьбу мясцовага настаўніцтва, прычым не толькі беларускага. Напрыклад, з прапановай паказаць п'есу да кіраўніцтва Даўгаўпілскага аддзелу БТТЛ звярнуўся кіраўнік Свентскай школы. 20 красавіка 1932 г. Было вырашана паставіць там п'есы *Збянтэжаны Саўка* і *Тарас на Парнасе*. 20 чэрвеня У. Ціхаміраў падаў справаздачу, з якой вынікала, што "вечарына прайшла сярэдне, прысутных на вечарыне было 52 асобы"[334].

У сезоне 1931/32 гг. артысты даўгаўпілскай трупы зладзілі 25 спектакляў, большасць якіх (11) паказалі ў мурах Даўгаўпілскай беларускай гімназіі, 7 – у беларускай пачатковай школе. І толькі тры разы –у правінцыі (Краслава, Свенты Ілукштанскага павета – 2). 12 пастановак рэжысіраваў К. Александровіч, а 13 – А. Ціхаміраў. Колькасць гледачоў складала ад 100 да 2 500 (найбольш прыйшло ў Даўгаўпілскі чыгуначны тэатр на п'есы *Здрада* і *На Полацкім замчышчы* ў рэжысуры У. Ціхамірава, а таксама *Каін і Авель* у рэжысуры К. Александровіча)[335].

У сезоне 1932/33 гг. даўгаўпілская трупа зладзіла яшчэ 9 пастановак (*Пашыліся ў дурні*, *Збянтэжаны Саўка* – красавік 1932 г. у Свентах; *На Антокалі* – 16 красавіка 1932 г.; *Як яны жаніліся*, *Заручыны Паўлінкі* – у гімназіі і школе; *Пашыліся ў дурні* – у школе, *На Антокалі*). 8 выступаў адбылося за кошт іншых арганізацый, а 1 быў зладжана самастойна (юбілейная вечарына). Прычынай нешматлікасці пастановак была няпэўная будучыня гімназіі[336]. Асобнай увагі патрабуе выпадак з пастаноўкай п'есы *Здрада*. 2 верасня 1932 г. цэнтральнае праўленне не раіла Даўгаўпілскаму аддзелу ставіць дадзеную п'есу, бо яе падрыхтоўка патрабавала значных сродкаў і кампетэнцый, у тым ліку прафесійнага рэжысёра, які ведае гістарычны побыт. На думку кіраўніцтва БТТЛ, п'еса была "вельмі цяжкая для

---

331 LVVA, 1747 f., 1 apr., 22 l., 8 lp.
332 LVVA, 1747 f., 1 apr., 22 l., 9 lp.
333 LVVA, 1747 f., 1 apr., 27 l., 60 lp.
334 LVVA, 1747 f., 1 apr., 22 l., 4 lp.
335 LVVA, 1747 f., 1 apr., 27 l., 65 lp.
336 LVVA, 1747 f., 1 apr., 22 l., 14 lp.

пастаноўкі аматарскімі сіламі”[337]. Ва ўмовах эканамічнага крызісу некаторыя пастаноўкі не прыносілі прыбытку. Напрыклад, 8 студзеня 1933 г. у мурах Даўгаўпілскай беларускай гімназіі была пастаўлена п’еса *Дрыгва*[338]. Прыбытак з вечарыны, аднак, склаў толькі 86 сантымаў[339].

У 1933 г. у працы ўправы Даўгаўпілскага аддзела адбыўся крызіс. 5 сакавіка 1933 г. адбыўся агульны сход сяброў (14 чал.), на якім быў абраны новы склад праўлення: У. Ціхаміраў, М. Краўчанка, К. Александровіч і кандыдат А. Абалевіч. На прапанову апошняга была абрана мастацкая калегія ў наступным складзе: С. Маціеўскі (старшыня), К. Лазоўскі, С. Саўкант і кандыдаты А. Райко і М. Каспяровіч[340]. Аднак І. Фёдараў ад імя рэвізійнай камісіі аспрэчыў вынікі выбараў новага праўлення, абгрунтаваўшы гэта тым, што не была падрыхтавана справаздача гэтай жа камісіі. На яго патрабаванне 7 траўня 1933 г. быў скліканы чарговы агульны сход сяброў (18 чал.), на якім прысутныя абралі новы склад праўлення аддзела: С. Маціеўскі (старшыня), У. Ціхаміраў (скарбнік), А. Райко і кандыдаты І. Фёдараў і С. Краўчанка. Гэтым разам выбараў не прызнаў А. Райко, які адмовіўся быць сакратаром і пагадзіўся толькі на пасаду сябра, што зрабіла немагчымым размеркаванне абавязкаў у новаабраным праўленні[341]. Каб пераадолець крызіс, 8 кастрычніка 1933 г. адбыўся чарговы агульны сход сяброў аддзела (8 чал.). Удзельнікі абралі новае праўленне ў складзе С. Маціеўскага (старшыня), У. Ціхаміравa (скарбнік) і М. Краўчанкі (сакратар), а таксама кандыдата Т. Гладковай[342].

8 студзеня 1933 г. Даўгаўпілскі аддзел БТТЛ адзначыў 5-гадовы юбілей. У гэты час яго старшынём быў С. Маціеўскі[343]. Рэдакцыя часопісу “Беларуская школа ў Латвіі” віншавала аддзел з 5-годдзем, адзначаючы: “*Нішто так не ўсведамляе з боку нацыянальнага і сацыяльнага, як добры тэатр і хор, дык праца Ваша ў гэтым кірунку не меншая, калі толькі не большая, чым праца нашых сярэдніх і аснаўных школ у Латвіі. Блізкасць Вашая да беларускае вёскі яшчэ больш павялічвае ролю і значэньне Вашае працы, дык працуйце ж і далей з тым жа падоймам і энергіяй, заўсёды памятаючы аб вялікім значэнні Вашае працы (...) Зара Вы стаіце ўжо на грамадскім грунце і маеце сталае таварыства, дык праца Ваша павінна пайсці, і ўжо ідзе, лепшымі поспехамі і вынікамі*”[344]. 29 красавіка 1933 г. рэактар часопіса пісаў кіраўніку

[337] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 77 lp.

[338] LVVA, 1747 f., 1 apr., 22 l., 23 lp.

[339] LVVA, 1747 f., 1 apr., 22 l., 25 lp.

[340] LVVA, 1747 f., 1 apr., 22 l., 14 lp.

[341] LVVA, 1747 f., 1 apr., 22 l., 18–19 lpp.

[342] LVVA, 1747 f., 1 apr., 22 l., 22 lp.

[343] Ул. Ціхаміраў, *Акт-юбілей Дзьвнскага аддзелу Т-ва Беларускага Тэатру ў Латвіі,* “Беларуская школа ў Латвіі” 1933, № 1(18), с. 264.

[344] LVVA, 1747 f., 1 apr., 28 l., 16 lp.

Даўгаўпілскага аддзела БТТЛ: “Дужа добра было б, каб трупа Ваша сфатаграфавалася ў поўным складзе і ў беларускіх вопратках”[345].

У гэты час дзейнасць трупы запаволілася, нягледзячы на тое, што да яе далучылася некалькі новых сяброў[346]. Даўгаўпілсцы раз-пораз ладзілі пастаноўкі па просьбе мясцовых беларускіх школ. У снежні 1933 г. школьная рада беларускай пачатковай школы звярнулася ў Даўгаўпілскі аддзел БТТЛ з просьбай зладзіць 31 снежня тэатральную пастаноўку, прыбытак з якой быў прызначаны на падтрымку незаможных вучняў. У звароце адзначалася, што “пажадана, каб была пастаўлена якая-небудзь камедыя ці п’еса нацыянальнага характару”[347]. У той самы час, на просьбу школьнай рады Даўгаўпілскай беларускай гімназіі, праўленне аддзела запланавала пастаноўку п’есы *Пашыліся ў дурні*[348]. Нягледзячы на згаданыя ініцыятывы, беларускае тэатральнае жыццё ў Даўгаўпілсе перажывала крызіс. 14 лютага 1934 г. адбылося апошняе пасяджэнне праўлення Даўгаўпілскага аддзела БТТЛ[349].

Падсумоўваючы дзейнасць БТТЛ, належыць звярнуць увагу на яе поспехі і паразы. Маштаб тэатральнай справы найлепш адлюстроўвае статыстыка мерапрыемстваў з удзелам рыжскай і даўгаўпілскай трупп у перыяд з кастрычніка 1931 па студзень 1932 г. У той перыяд артысты падрыхтавалі 22 тэатральныя выступы, у тым ліку рыжскі тэатр – 12 і даўгаўпілскі – 10.

Табліца 31. Пералік мерапрыемстваў, зладжаных рыжскай і даўгаўпілскай тэатральнымі трупамі

Дата	Назва пастаноўкі/імпрэзы	Месца	Колькасць гледачоў
Рыжскі аддзел			
10.10.1931	*Мікітаў лапаць*	Рускі народны тэатр	400
17.10.1931	*Бацькава сэрца*	1-я Рыжская беларуская школа	160
7.11.1931	*Мікітаў лапаць*	Клуб “Улей”	180
14.111931	*Бацькава сэрца*	2-я Рыжская Беларуская школа	250
28.11.1931	*Бацькава сэрца*	Рускі народны тэатр	270
5.12.1931	*Пашыліся ў дурні*	Рускі народны тэатр	307

[345] LVVA, 1747 f., 1 apr., 28 l., 7 lp.

[346] У 1933 г. Аляксандр Казачонак выслаў заяву на імя кіраўніцтва Даўгаўпілскага аддзела, у якой пісаў: “*Гэтым маю гонар прасіць вышэй адзначанае праўленне залічыць мяне сябрам тэатра. Жадаючы працаваць на тэатральнай ніве абавязуюся быць актыўным працаўніком*”. LVVA, 1747 f., 1 apr., 28 l., 8 lp.

[347] LVVA, 1747 f., 1 apr., 28 l., 5 lp.

[348] LVVA, 1747 f., 1 apr., 22 l., 24 lp.

[349] LVVA, 1747 f., 1 apr., 22 l., 26 lp.

Дата	Назва пастаноўкі/ імпрэзы	Месца	Колькасць гледачоў
12.12.1931	*Пашыліся ў дурні*	Заля "Марс"	215
23.01.1932	*Канцэрт*	1-я Рыжская беларуская школа	150
27.02.1932	*Чорт і баба*	1-я Рыжская беларуская школа	100
9.04.1932	*Змагары за ідэю*	Рускі народны тэатр	350
16.04.1932	*Канцэрт*	1-я Рыжская беларуская школа	120
7.05.1932	*Хлебароб па-амерыканску*	1-я Рыжская беларуская школа	200
Даўгаўпілскі аддзел			
13.09.1931	*Мікітаў лапаць; Пасланец*	Свенты	?
10.10.1931	*Як яны жаніліся*	Даўгаўпілская беларуская гімназія	?
1.11.1931	*На Полацкім замчышчы; Каін і Авель*	Даўгаўпілскі гарадскі тэатр	?
14.11.1931	*Дзядзька Якуб*	Даўгаўпілская беларуская гімназія	?
6.02.1932	*На Антокалі*	Даўгаўпілская беларуская гімназія	?
20.02.1932	*Пашыліся ў дурні*	Даўгаўпілская беларуская гімназія	
27.02.1932	*Пашыліся ў дурні*	Даўгаўпілская беларуская гімназія	?
10.03.1932	*Дзядька Якуб*	Даўгаўпілская беларуская гімназія	?
22.03.1932	*Як яны жаніліся*	Даўгаўпілская беларуская гімназія	
19.04.1932	*Мікітаў лапаць*	Краслава	?

Крыніца: LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 73–74 lpp.

Бясспрэчную ролю ў дзейнасці БТТЛ адыграў К. Езавітаў, які праяўляў актыўнасць у арганізацыі асобных спектакляў, вёў пошук рэжысёраў, займаў адказныя пасады ў цэнтральным праўленні таварыства. Чынную падтрымлівалі БТТЛ беларускія грамадскія арганізацыі і школы. У выпадку рыжскага асяродку гэта было таварыства "Беларуская хата", якое давала артыстам памяшканне, а ў другім – Даўгаўпілская беларуская гімназія, на сцэне якой ставіліся спектаклі і адбываліся рэпетцыі[350].

На якасць ігры абедзвюх беларускіх труп уплываў факт, што яны не былі прафесійнымі. Трупы складаліся з аматараў тэатральнага мастацтва, з якіх толькі частка атрымала адпаведную прафесійную падрыхтоўку ў тэатральнай студыі, а большасць скончыла кароткатэрміновыя курсы[351]. Беларускія акцёры выступалі пад кіраўніцтвам рэжысёраў – латышоў і рускіх, паколькі сярод беларусаў не было асоб з адпаведнай асветай і падрыхтоўкай. На думку некаторых сяброў кіраўніцтва БТТЛ, гэта з'яўлялася слабым бокам трупы,

[350] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 94 lp.

[351] *Беларускі тэатр у Латвіі*, "Шлях праўды" 1930, 24 X, с. 3

якая патрабавала “энергічнага і працаздольнага рэжысёра-беларуса, бо рэжысёры іншых нацыянальнасцяў слаба разумеюць дух беларускіх п’ес”[352].

Абедзве трупы працавалі ў цяжкіх матэрыяльных умовах. Тэатральная дзейнасць патрабавала выдаткаў. Першую дапамогу БТТЛ атрымала ў снежні 1927 г. – 130 латаў ад Беларускага школьнага аддзела і 600 латаў ад Культурнага фонду Латвіі[353]. Іншай крыніцай фінансавання была дапамога ахвярадаўцаў. Напрыклад, увесну 1933 г. беларуская моладзь ахвяравала на карысць тэатра 25 латаў, Рыжская беларуская гімназія – 550 латаў. Здаралася, што значныя сумы грошай ахвяравалі фізічныя асобы. У прыватнасці, Я. Камаржынскі перадаў 105 латаў, У. Пігулеўскі ў 1932 г. – 220,[354] К. Александровіч у лютым 1932 г. – 40[355].

Уяўленне пра баланс прыбытку і выдаткаў БТТЛ дае аналіз бюджэту за асобныя гады. У 1927 г. прыбытак БТТЛ склаў 753,35 латы, якія паходзілі з дзяржаўных субсідый. У першай палове наступнага году арганізацыя атрымала ўступныя ўнёскі сяброў – 75 латаў, штомесячныя складкі – 30, дапамогу Культурнага фонду Латвіі – 510, выручку са спектакляў – 367,55. Агулам прыбытак таварыства склаў 1 785,70 лат. У той самы час выдаткі арганізацыі склалі 1 247,40 латаў, з якіх 100 прыпала на дапамогу Даўгаўпілскаму аддзелу, заробак рэжысёра – 160, заробак акцёраў – 165. Астатнія выдаткі былі звязаныя з пастаноўкай трох спектакляў[356]. У сезоне 1928/29 гг. праект бюджэту прадугледжваў атрыманне 23 500 латаў, у тым ліку 200 – з уступных унёскаў, 300 – сяброўскіх складак, 200 – ахвяраванняў, 3 200 – выручкі за пастаноўкі ў Рызе, 2 400 – выручкі за пастаноўкі ў Даўгаўпілсе, 1 200 – выручкі за пастаноўкі ў Лудзы, 2 000 – выручкі за пастаноўкі на правінцыі. Аднак найбольшыя субсідыі прыходзілі з Культурнага фонду Латвіі (10 000) і Рыжскага гарадскога самакіравання (4 000). Пры гэтым кіраўніцтва таварыства разлічвала, што выдаткі складуць 36 200, што давала ажно 12 700 дэфіцыту. Асноўныя выдаткі тычыліся: у Рызе – утрымання дзесяці сталых артыстаў (9 600 лат), кіраўніка і рэжысёра (2 400), статыстаў і хору (2 000); у Даўгаўпілсе – утрымання пяці сталых артыстаў (4 800), дарожных выдаткаў (2 000), статыстаў і хору (2 000). Акрамя таго, значныя выдаткі былі звязаныя з набыццём гардэробу для абедзвюх труп (6 000), дэкарацый і мэблі, з іншымі гаспадарчымі выдаткамі (4 000). Арэнда памяшкання ў абодвух выпадках каштавала па 1 200 лат. Кіраўніцтва БТТЛ спадзявалася,

---

[352] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 156–157 lpp.

[353] LVVA, 1747 f., 1 apr., 30 l., 2, 4, 19 lpp.

[354] LVVA, 1747 f., 1 apr., 30 l., 32–33 lpp.

[355] Ахвяраваныя грошы былі ганарарам за пастаноўку п’есы *Каін і Авель*. LVVA, 1747 f., 1 apr., 21 l., 49 lp.

[356] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 54–55 lpp.

што апошнюю можна будзе пакрыць з дапамогі Міністэрства асветы (са сродкаў, прызначаных на пазашкольную адукацыю), або з дапамогі ўраду, якую атрымлівалі нацмены[357].

У наступныя гады выдаткі толькі выраслі, што паглыбляла фінансавы крызіс арганізацыі[358]. 4 чэрвеня 1930 г. кіраўніцтва таварыства зацвердзіла праект запыту пра дапамогу памерам у 5 тыс. лат, які быў перададзены ў БША. Большую частку бюджэту складалі выдаткі на рэжысуру і падрыхтоўку новых пастановак у Рызе (1 000) і Даўгаўпілсе (1 000), гардэроб акцёраў (1 000), арганізацыю хору і аплату дырыжораў (500), дэкарацыі і грым (500)[359]. Бюджэт БТТЛ на 1931/32 гг. складаў 6 350 латаў, у тым ліку 4 500 латаў было атрымана ад Беларускага школьнага аддзела, 400 – з выручкі ад пастановак, 300 – з сяброўскіх складак, 50 – з уступных унёскаў і 1 100 – з ахвяраванняў[360].

Такім чынам, дзяржаўныя субсідыі, ахвяраванні і прыбытак ад тэатральнай дзейнасці толькі часткова дапамагалі арганізацыі ўтрымацца, але гэтага не хапала на нармальнае функцыянаванне тэатра[361]. Скрушнае матэрыяльнае становішча гледачоў прымушала акцёраў нярэдка граць бясплатна[362].

У міжваеннай Латвіі назіраліся і праявы беларускай музычнай культуры. Галоўным творчым цэнтрам з'яўлялася Рыга. У латвійскай сталіцы жыла кампазітарка Юлія Александровіч, былая выхаванка Даўгаўпілскай беларускай гімназіі і Латвійскай кансерваторыі. Яна займалася музычнай апрацоўкай твораў беларускіх паэтаў. У 1932 г. Ю. Александровіч склала музыку на верш П. Масальскага (псеўданім Пятро Сокал) *Вяснянка*, а таксама апрацавала музыку оперы на тэкст Я. Райніса *Дзьміце, вецярочкі*[363]. На сталічных сцэнах адбываліся музычныя выступы Ю. Александровіч, Ганны Бедаравай і Анэлі Латонас-Дзямідавай[364]. 20 сакавіка і 7 красавіка 1932 г. у сядзібе таварыства "Беларуская хата" дзве апошнія далі канцэрты[365]. Акрамя таго, А. Латонас-Дзямідава на хвалях рыжскага радыё 20 снежня 1932 г. выканала шэраг беларускіх песень[366]. Выяўлялася творчая ініцыятыва і ў Латгаліі. На пасяджэнні беларускіх арганізацый Даўгаўпілса 2 жніўня 1926 г. было прапанавана падрыхтаваць кінематаграфічныя здымкі *З беларускага*

---

[357] LVVA, 1747 f., 1 apr., 25 l., 9 lp.

[358] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 135–136 lpp.

[359] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 170 lp.

[360] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 42 lp.

[361] *Наш тэатр,* "Думка беларуса" 1931, № 2, с. 4.

[362] *У Латвіі,* "Родны край" № 1 ад 1 студзеня 1933 г., с. 7.

[363] *Хроніка беларускага жыцьця у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 2(12), с. 177.

[364] *Хроніка беларускага жыцьця ў Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, 1(11), с. 160.

[365] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 74 lp.

[366] *Хроніка беларускага жыцьця у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 1(18), с. 272.

жыцця[367]. 24 красавіка 1932 г. у Даўгаўпілскай кансерваторыі выступілі В. Бароўская і А. Латонас[368]. У рэпертуары беларускіх спевакоў пераважалі нумары этнаграфічнага кшталту[369].

Краязнаўчая і навуковая дзейнасць

Да праяў беларускага нацыянальнага жыцця ў Латвіі ў разгляданы перыяд належыць залічыць краязнаўчую і навуковую дзейнасць. Галоўным завадатарам працы ў гэтым напрамку быў К. Езавітаў, які натхніўся прыкладам краязнаўчай працы ў Савецкай Беларусі. З яго ініцыятывы 1 чэрвеня 1926 г. быў створаны навукова-краязнаўчы гурток[370]. На першым сходзе гуртка (старшыня К. Езавітаў, сакратар П. Масальскі) была распрацаваная адозва да беларускага настаўніцтва і грамадскасці з заклікам узяць удзел у краязнаўчай працы і далучыцца да збірання этнаграфічных матэрыялаў[371]. За сем першых месяцаў існавання гурток правёў дванаццаць сходаў, на якіх абмяркоўваліся розныя пытанні. З думкай пра спрыянне краязнаўчай працы К. Езавітаў склаў брашуру *Бярыцеся ўсе за навукова-даследчую працу*. Аўтар заклікаў запісваць вусную народную творчасць старога пакалення латвійскіх беларусаў. Кіраўнік гуртка лічыў, што неабходна заняцца стварэннем народнага слоўніка латгальскіх беларусаў[372]. Ён адзначаў: "*Матэрыялы, якія мы тутака збяром, будуць асабліва цікавыя з боку навуковага таму, што мы тутака жывём у мясцовасці, дзе сыходзяцца этнаграфічныя межы расейска-латышска-літоўска-беларускія і дзе культуры і мовы гэтых народаў узаемна ўплываюць адзін на аднаго і ўсе на ўсіх. Гэтых матэрыялаў нідзе на тэрыторыі Беларусі сабраць немагчыма*"[373]. Беларускі дзеяч планаваў скончыць збор этнаграфічнага матэрыялу да снежня 1927 г.[374]

---

[367] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 93, л. 8 зв.

[368] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 74 lp.

[369] І. Апіня, *На берагах Даўгавы – Дзвіны: Латышска-беларускія ўзаемасувязі* [у:] *Беларусіка=Albarutheniса 6. Беларусь паміж Усходам і Захадам: Праблемы міжнацыянальнага, міжрэлігійнага і міжкультурнага ўзаемадзеяння, дыялогу і сінтэзу*, рэд. У. Конан і інш., Менск 1997, с. 232.

[370] LVVA, 3009 f., 1 apr., 3 l., 80 lpp.

[371] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 155–156 lpp.

[372] К. Езавітаў, *Бярыцеся ўсе за навукова-дасьледчую працу*, Рыга 1926, с. 14.

[373] *Бярыцеся ўсе за навукова-даследчую працу* [у:] *Крывіцкія руны. Вып. II: Беларускі культурны мацярык у Латвіі*, рэд. М. Казлоўскі, С. Панізнік, Менск 2017, с. 368.

[374] *Інструкцыя да збірання народнага слоўніка-тэрміналагічнага матэрыялу ў беларускай мове* [у:] *Крывіцкія руны. Вып. II: Беларускі культурны мацярык у Латвіі*, рэд. М. Казлоўскі, С. Панізнік, Менск 2017, с. 374.

Заклік К. Езавітава меў водгук сярод грамадскасці. Настаўнікі пачалі дасылаць на адрас гуртка запісаныя ў вёсках творы. Напрыклад, настаўнік Сымон Маціеўскі ў ліпені 1926 г. даслаў два народныя апавяданні з Пасіенскай воласці *Зайздрасць чалавечая* і *Як мужык грошы знайшоў*. Настаўнік Мікалай Талерка даслаў апавяданне з Прыдруйшчыны *Пра трох ксяндзоў і чорта*, а селянін з Ізабэлінскай воласці Пруцька запісаў жарт *Аб трох гузіках*. Дасланыя апавяданні зачытвалі падчас сходаў сяброў гуртка і рэкамендавалі да друку на старонках газеты "Голас беларуса". Каб наладзіць краязнаўчую працу, К. Езавітаў пашыраў сярод настаўніцтва "Інструкцыю да збірання народнага слоўніка-тэрміналагічнага матэрыялу ў беларускай мове". На другім сходзе гуртка (15 чэрвеня 1926 г.) было вырашана надрукаваць гэты дакумент у газеце "Голас беларуса", а таксама выдаць асобнай брашурай. Сход ухваліў таксама стварэнне этнаграфічнага гуртка сярод вучняў Даўгаўпілскай беларускай гімназіі. На гэтым жа сходзе былі прачытаныя два народныя апавяданні, атрыманыя ад жыхароў Прыдруйшчыны – "*Бабскае верхаўніцтва* і *Гультай вінаваты*[375]. Пад уплывам дзейнасці гуртка вучні Ляўдарскай беларускай асноўнай школы пад кіраўніцтвам настаўніцы Марыі Каспяровіч падрыхтавалі краязнаўча-літаратурны зборнік *Пралеска*, які ўтрымліваў запісаную вусную народную творчасць і вучнёўскія вершы[376].

Гурток намагаўся праводзіць навукова-папулярную дзейнасць. Напрыклад, на сходзе сяброў 1 ліпеня 1926 г. прысутныя заслухалі даклады К. Езавітава *Бярыцеся ўсе за навуковую працу* і Чарняўскага *Да 5-годдзя культурнае працы сярод беларусаў у межах Маскоўшчыны*[377]. Жаданне супрацоўнічаць з гуртком выказаў Баляслаў Брэжга, які перадаў мапу Полацкага ваяводства (1579–1588), якую знайшоў у Ватыканскім музеі. На сходзе сяброў гуртка 20 жніўня 1926 г. было вырашана надрукаваць яе ў газеце "Голас беларуса". Гурток ладзіў чытанні, мэтай якіх была папулярызацыя навуковых ведаў сярод сяброў. 10 верасня 1926 г. апошнія азнаёміліся з рэцэнзіяй Ігната Дварчаніна на пераклад Макарам Краўцовым твору Генрыка Сянкевіча *Бартэк-пераможнік*[378]. 20 верасня 1926 г. К. Езавітаў прачытаў два даклады – *Рэлігійнае жыццё беларускага народа* і *Почему мы должны защищать свой родной простой язык*[379]. Акрамя таго, прысутныя азнаёміліся

[375] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 155–156 lpp.

[376] Улетку 1929 г. К. Езавітаў пераслаў зборнік у Менск на імя навуковага сакратара Цэнтральнага бюро краязнаўства Міколы Каспяровіча з просьбай надрукаваць яго на старонках выданняў "Полымя" ці "Наш край". LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 196–197 lpp. Ліст К. Езавітава да М. Каспяровіча, 5 ліпеня 1929 г.

[377] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 155–156 lpp.

[378] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 155–156 lpp.

[379] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 155–156 lpp.

з брашурай Антона Лёсіка і Сцяпана Некрашэвіча *Да рэформы беларускага правапісу*. Удзельнікі сходу даручылі К. Езавітаву зрабіць свае заўвагі да гэтай працы[380].

Плёнам працы гуртка належыць лічыць пашырэнне ў латвійскім грамадстве ведаў пра беларусаў. У 1928 г. намаганнямі гуртка супольна з Таварыствам беларускіх настаўнікаў у Латвіі ў рыжскіх бібліятэках былі створаныя беларускія аддзелы: у Латвійскай дзяржаўнай бібліятэцы, 6-й гарадской бібліятэцы (на Саркандаўгаве), Галоўнай гарадской бібліятэцы і бібліятэцы Уселатвійскага настаўніцкага хаўруса[381]. У 1929 г. К. Езавітаў заклікаў сяброў гуртка С. Сахарава, С. Казеку, А. Барткевіча, М. Талерку, С. Маціеўскага зладзіць шэраг публічных лекцый, прысвечаных ператварэнню Інбелкульта ў Беларускую акадэмію навук. Ён лічыў гэты крок святам беларускай культуры, якое належыць годна адзначыць[382].

Істотным крокам у развіцці навукова-краязнаўчай працы латвійскіх беларусаў было стварэнне ў 1932 г. на базе гуртка новай арганізацыі – Беларускага навукова-краязнаўчага таварыства ў Латвіі (БНКТЛ) (*Latvijas "Baltkrievu dzimtenes zinātniskās pētīšanas biedrība*"). 15 красавіка 1932 г. у Рызе, у будынку на вуліцы Маскоўскай, 173, адбыўся сход ініцыятыўнай групы па стварэнні арганізацыі, на якім прысутнічалі: К. Езавітаў, А. Родзька, С. Сіцько, М. Краўчанка, К. Мяжэцкі, Г. Нікіфароўская, В. Доўгая і Я. Кастылюк. Пасля рэферату К. Езавітава пра патрэбу даследавання беларускай народнай творчасці ў Латгаліі і на Ілукшчыне ўдзельнікі пастанавілі заснаваць БНКТЛ і даручыць К. Езавітаву падрыхтоўку праекта статута арганізацыі[383]. На другім пасяджэнні групы (9 траўня) быў ухвалены праект статута, а К. Езавітаву даручаны пераклад яго на латышскую мову і падрыхтоўка да рэгістрацыі ў судзе[384]. На трэцім пасяджэнні (20 траўня) удзельнікі падпісалі перакладзены Н. Пінскай на латышскую мову статут[385]. 27 траўня К. Езавітаў перадаў дакумент у Рыжскі акруговы суд. 7 ліпеня 1932 г. апошні зарэгістраваў статут таварыства. На 4-м пасяджэнні (15 ліпеня) ініцыятыўная група аднагалосна абрала часовае праўленне ў складзе: К. Езавітава (старшыня), А. Родзькі (намеснік), Г. Нікіфароўскай (сакратар), С. Сіцько (скарбнік) і М. Краўчанкі (сябра). Акрамя таго, прысутныя даручылі часоваму праўленню неадкладна распачаць арганізацыйную працу[386].

---

[380] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 155–156 lpp.

[381] *Беларускія бібліятэкі ў Рызе*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1929, № 9(1), с. 7.

[382] LVVA, 3235 f., 2 apr., 4635 l., 127 lp.

[383] LVVA, 1897 f., 1 ap., 2 l., 1 lp.

[384] LVVA, 1897 f., 1 ap., 2 l., 2 lp.

[385] LVVA, 1897 f., 1 ap., 2 l., 3 lp.

[386] LVVA, 1897 f., 1 ap., 2 l., 4 lp.

Згодна са статутам, арганізацыя ставіла за мэту "*аб'яднаць усе беларускія і прыхільныя беларускаму адраджэнню навуковыя і аматарскія сілы ў Латвіі, якія працуюць зараз кожны паасобку над пытаннем беларускае культуры і навукі; працаваць супольнымі сіламі над пытаннямі: гісторыі, геаграфіі, этнаграфіі, літаратуры, мастацтва, музыкі, фальклору і эканомікі Латвіі і Беларусі; пашыраць здабытыя веды сярод беларускага і латышскага грамадства ў Латвіі; садзейнічаць усімі вышэйпералічанымі спосабамі ўзаемнаму азнаямленню і збліжэнню беларускага і латышскага народаў*"[387]. Аднак найвыразней галоўныя мэты таварыства акрэсліў К. Езавітаў у лісце ў рэдакцыю заходнебеларускага часопіса "Шлях моладзі" (10 кастрычніка 1932 г.): Паводле аўтара, новая арганізацыя ставіла за мэту: 1) збор беларускай народнай творчасці ў Латвіі; 2) збор тутэйшых асаблівасцей беларускай мовы і падкрэсленне ўзаемных уплываў беларускай, латышскай і латальскай моваў; 3) укладанне параўнальнага беларуска-латышска-латгальскага слоўніка, а пры магчымасці ўключэнне ў яго літоўскай мовы, 4) стварэнне Беларускага этнаграфічнага музея ў Рызе[388]. Сябрамі таварыства маглі быць не толькі фізічныя асобы, але і юрыдычныя. Арганізацыя магла ладзіць культурныя мерапрыемствы, засноўваць грашовыя фонды, ствараць навукова-краязнаўчыя архівы, бібліятэкі-чытальні, камісіі і секцыі, займацца выдавецкай дзейнасцю, праводзіць курсы і лекцыі. Сядзіба арганізацыі знаходзілася ў Рызе па адрасе: вул. Ільінская (*Elija iela*), 20/25[389].

На першым пасяджэнні часовага праўлення (15 ліпеня 1932 г.) удзельнікі прынялі рашэнне звярнуцца ў Рыжскую камісію асветы з просьбай зарэгістраваць БНКТЛ як асветную ўстанову. Адначасова было вырашана стварыць аддзелы таварыства ў Даўгаўпілсе і Лудзы[390]. 18 ліпеня 1932 г. К. Езавітаў звярнуўся да С. Сахарава з просьбай узяць на сябе цяжар арганізацыі Даўгаўпілскага аддзела і паспрыяць далучэнню мясцовых настаўнікаў і вучняў да збору народнай творчасці[391]. Акрамя С. Сахарава да найбольш дзейных сябраў Даўгаўпілскага аддзела належалі А. Ціхамірaў і А. Барткевіч[392]. 27 ліпеня 1932 г. на чарговым пасяджэнні праўлення ў склад таварыства былі

---

[387] *Статут Беларускага навукова-краязнаўчага т-ва ў Латвіі* [у:] *Крывіцкія руны. Вып. II: Беларускі культурны мацярык у Латвіі*, рэд. М. Казлоўскі, С. Панізнік, Менск 2017, с. 392; "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 3, с. 186.

[388] LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 68 lp.

[389] *Статут Беларускага навукова-краязнаўчага т-ва ў Латвіі* [у:] *Крывіцкія руны. Вып. II: Беларускі культурны мацярык у Латвіі*, рэд. М. Казлоўскі, С. Панізнік, Менск 2017, с. 392–393.

[390] LVVA, 1897 f., 1 ap., 2 l., 7 lp.

[391] LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 4 lp.

[392] Э. Екабсонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [в:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 69.

прынятыя: Я. Кастылюк, С. Сахараў, Р. Плыгаўка, У. Ціхаміраў, А. Барткевіч, С. Казека і В. Доўгая. Па сутнасці гэтыя людзі разам з кіраўніцтвам складалі касцяк арганізацыі[393]. Таварыства супрацоўнічала з беларускім настаўніцтвам, вучнямі, удзельнікамі настаўніцкіх курсаў. Менавіта настаўнікі ачольвалі рэгіянальныя аддзелы арганізацыі: С. Сахараў і А. Барткевіч – у Даўгаўпілсе і С. Казека – у Лудзе. З дапамогай настаўніцтва арганізацыя ладзіла збор беларускай вуснай народнай творчасці. Паколькі таварыства лічылася спадкаемцам навукова-краязнаўчага гуртка, яно атрымала яго архіў[394].

Нягледзячы на шматабяцальны пачатак, да канца 1932 г. да таварыства далучылася толькі 18 асоб. У разгар актыўнасці БНКТЛ налічвала 15 сяброў, 5 сяброў-карэспандэнтаў і 15 кандыдатаў[395]. З прычыны нешматлікасці нават адкладаўся вальны з'езд сяброў[396]. Нарэшце 2 верасня 1933 г. у будынку 1-й Рыжскай беларускай школы адбыўся першы агульны сход сяброў БНКТЛ, на якім прысутнічала 12 чал.[397] Удзельнікі вырашылі: 1) актывізаваць збор беларускага фальклору ў Латвіі, 2) павялічыць колькасць сяброў таварыства, 3) прыступіць да друку сабраных матэрыялаў. Адначасова было абрана праўленне ў складзе: К. Езавітава (старшыня), Г. Нікіфароўскай (намесніца старшыні), А. Родзькі (намеснік старшыні), С. Сіцько (скарбнік), Ф. Клагіша (сакратар), і кандыдатаў М. Краўчанкі, Я. Клагіша і Я. Кастылюка. У склад Рэвізійнай камісіі былі абраны Язэп Каяла, С. Сахараў і Ян Кудраўцоў[398].

Асноўнай крыніцай утрымання таварыства былі сяброўскія складкі і ў нязначнай ступені прыбытак з продажу выданняў. Арганізацыя не атрымлівала субсідый ад дзяржаўных і грамадскіх арганізацый. Выдаткі з бюджэту БНКТЛ прызначаліся на выданне літаратуры і сабраных народных твораў, рэгістрацыю арганізацыі, фінансаванне фальклорных экспедыцый, канцылярскія патрэбы[399].

Найбольшую актыўнасць БНКТЛ праяўляла ў перыяд з сярэдзіны красавіка 1932 да верасня 1933 г. У гэты час адбылося 25 пасяджэнняў управы

---

393 LVVA, 1897 f., 1 ap., 2 l., 9 lp.

394 LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 51 lp.

395 Э. Екабсонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [в:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 69.

396 LVVA, 1897 f., 1 ap., 2 l., 43 lp.

397 Гэта былі: К. Езавітаў, Г. Нікіфароўская, П. Масальскі (ад імя Рыжскай беларускай гімназіі), Язэп Каяла (ад імя 1-й Рыжскай беларускай школы), С. Сіцько, М. Краўчанка, Франц Клагіш, Язэп Камаржынскі, Пятро Мірановіч, Аляксандр Родзька, Вікторыя Доўгая, Ян Кудраўцоў (ад імя 2-й Рыжскай беларускай школы).

398 LVVA, 1897 f., 1 ap., 2 l., 59 lp.; *Праца Беларускага Навукова-Краязнаўчага Т-ва*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 6(23), с. 342.

399 LVVA, 1897 f., 1 ap., 2 l., 43 lp.

і адзін агульны сход[400]. Збіранне вуснай народнай творчасці латгальскіх ды ілукштанскіх беларусаў было адным з галоўных кірункаў дзейнасці арганізацыі. Быў набыты фанограф, каб запісваць вусную народную творчасць падчас экспедыцый па вёсках. Кіраўніцтва таварыства звярталася да беларускага настаўніцтва і грамадскасці з заклікам далучыцца да навукова-краязнаўчай працы, даваць інфармацыю "аб вядомых ім вясковых спеваках і спявачках". На патрэбы этнаграфічных даследаванняў быў складзены і разасланы настаўнікам апытальнік *Аб волатах, люцічах і ваўках*. Кіраўніцтва таварыства звяртала ўвагу на ўнікальнасць і асаблівасці беларускіх гаворак у Латгаліі, пра што сведчыць ліст К. Езавітава кс. Антону Лапаценку: "*Асабліва для нас цікавы Ваш раён, гэтак адарваны ад беларускае этнаграфічнае тэрыторыі. Калі Вы прыступіце да справы сістэматычна і ўпарта, дык дужа абагаціце беларускую навуку, якой якраз дужа бракуе вестак аб беларусах у Латгалії*"[401]. У звароце кіраўніцтва БНКТЛ да беларускай грамадскасці (18 ліпеня 1932 г.) чытаем: "*Т-ва мае бліжэйшай сваёй мэтай сабраць народныя творы (песні, казкі, апавяданні, загадкі, загаворы, назовы мясцовасцяў, звычаі і абрады) тых беларусаў, што пражываюць у Латвіі і Літве. Сабраныя матэрыялы будуць паступова друкавацца ў штомесячніку 'Беларуская школа ў Латвіі', а потым адбіты будуць асобным выданнем. Гэтым у беларускую навуку будзе ўнесены надзвычайна важны ўклад, бо аб літоўскіх і латвійскіх беларусах надзвычайна мала матэрыялаў у дагэтуль выдрукаваных творах народнай творчасці*"[402]. Тым часам у лісце кіраўніка таварыства старажылу Дамініку Мяжэцкаму чытаем: "*Вы жывеце ў гушчы беларускага жыхарства ды і самі ведаеце шмат беларускіх прыказак, звычаяў, казак, апавяданняў, пасловіцаў, прыкметаў ды песняў. Дык дужа прашу і Вас і паважаную сямейку Вашую прыслужыцца навуцы беларускай і сабраць і запісаць усё, што толькі самі памятаеце ды што можна пачуць ад ваколічнага сялянства і шляхты беларускай. Справа гэтая надзвычайна важная і пільная для нас, бо многія бабкі і дзяды, якія шмат ведалі напамяць беларускіх народных твораў, зара вымірaюць, а з імі вымірае і народнае багацце наша*"[403].

Акрамя чыста навуковай задачы кіраўніцтва таварыства бачыла ў збіранні этнаграфічнага матэрыялу і палітычную мэту. У звароце К. Езавітава да дырэктара Лудзенскай беларускай пачатковай школы (18 ліпеня 1932 г.) чытаем: "*Звяртаемо ўвагу Вашу, што апублікаванне гэтых матэрыялаў будзе мець надзвычайнае значанне для ўмацавання стану Вашае школы, бо беларускія народныя творы з Люцыншчыны і Люцыну будуць лішні раз даводзіць*

[400] LVVA, 1897 f., 1 ap., 2 l., 1 lp.
[401] LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 9 lp.
[402] LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 3 lp.
[403] LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 7 lp.

аб беларускасці жыхарства ўва многіх валасцёх"[404]. У падобным тоне быў вытрыманы зварот да кіраўніка Прыдруйскай беларускай пачатковай школы (18 ліпеня 1932 г.): "*Для беларускае-ж меншасці ў Латвіі надрукаванне збораў з Латгаліі і Ілукштаншчыны будзе мець надзвычайна важнае значанне, бо гэта будзе лішні раз самым моцным чынам даводзіць аб тым, што жыхары пэўных валасцей – сапраўды з'яўляюцца беларусамі*"[405]. Варта падаць яшчэ адзін прыклад, які сведчыць пра палітычны падтэкст этнаграфічнай працы. У лісце кіраўніку Вайцюлеўскай беларускай пачатковай школы (18 ліпеня 1932 г.) К. Езавітаў адзначаў: "*Зара нам абавязкова трэба правесці гэтую працу, бо беларускія бабулькі і дзяды, ведаўшыя шмат чаго напамяць, паступова адзін за адным вымiраюць і ўносяць з сабой нашы народныя скарбы. Публікацыя гэтых твораў будзе яшчэ цікавая і тым, што з'явіцца адным з мацнейшых довадаў існавання ў Вашых валасцёх адвечнага беларускага жыхарства*"[406]. 18 кастрычніка 1932 г. кіраўнік БНКТЛ пісаў сябрам педрады і дырэкцыі Рыжскай беларускай вячэрняй школы: "*Зара для беларускае меншасці ў Латвіі асабліва важна сабраць і выдрукаваць народныя творы, з паказаннем мясцовасцяў, з якіх яны паходзяць, бо гэта адзін з магутнейшых доказаў існавання беларусаў у Латвіі*"[407].

5 студзеня 1933 г. на прапанову К. Езавітава праўленне БНКТЛ прыняло рашэнне звярнуцца праз штомесячнік "Беларуская школа ў Латвіі" з заклікам да беларускай грамадскасці: каб людзі паведамлялі прозвішчы і адрасы беларускіх народных спевакоў і спявачак, каб іх можна было запісаць на фанограф[408]. Каб актывізаваць збіранне этнаграфічнага матэрыялу, 15 лютага 1933 г. праўленне арганізацыі зацвердзіла *Праграму збірання вуснай народнай творчасці*[409]. Яна была распрацавана К. Езавітавым на падставе *Праграмы камісіі па народнай славеснасці пры Этнаграфічным аддзеле Таварыства аматараў натуразнаўства, астраноміі і этнаграфіі* і *Праграмы збірання вуснай народнай творчасці*, апублікаванай Літаратурнай камісіяй Інстытута беларускай культуры[410]. Акрамя таго, была складзена інструкцыя па зборы вуснай народнай творчасці, якую атрымалі кіраўнікі беларускіх школ і грамадскія актывісты. Паўнейшае ўяўленне пра мэты палявой працы дае ўрывак ліста кіраўніцтва БНКТЛ Эдварду Вайводзішу, кіраўніку школы на Прыдруйшчыне: "*Нас цікавяць песні, байкі, замовы, прыказкі, звычаі (пры*

[404] LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 5 lp.
[405] LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 6 lp.
[406] LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 8 lp.
[407] LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 77 lp.
[408] LVVA, 1897 f., 1 ap., 2 l., 44 lp.
[409] LVVA, 1897 f., 1 ap., 2 l., 48 lp.
[410] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 29, л. 1–8.

ўсіх запісах трэба адзначаць – хто, ад каго, дзе і калі запісаў. Запісы рабіць на адным баку старонкі). Добра было б, каб Вы і Вашы калегі апісалі падрабязна такія рэчы як: 'Беларускае вяселле ў Прыдруйшчыне' (пачынаючы са сватання, усе звычаі агледзін, заручын і самаго вяселля з усімі гутаркамі, спевамі, абрадамі, замовамі, забабонамі і значаннем усяго гэтага ў тлумачэнні); 'Беларускае пахаванне ў Прыдруйшчыне' (спевы, абрады, аб якіх мо не ведае ксёндз і поп звычаі); 'Талака ў Прыдруйшчыне'; 'Дзіцячыя гульні ў Прыдруйшчыне'; 'Супрадкі (ці 'пасядзелкі') на Прыдруйшчыне' (з звычаямі, парадкамі, удзельнікамі, традыцыямі); замалёўкі хат, тыпаў; фатаграфіі тыпаў і хатніх вырабаў, тканіны, начынне, разьбярныя вырабы, якія маглі б сысці за пачатак для беларускага аддзела пры Дзяржаўным Этнаграфічным музеі ў Рызе (згода на аддзел у нас ужо ёсць і трэба збіраць экспанаты). Справа гэтая надзвычайна важная. Просімо Вас і сяброў Вашых далажыць усе высілкі ў Вашым раёне, асабліва для нас цікавым, вычарпаць ўсе магчымасці"[411].

10 красавіка 1933 г. праўленне таварыства абавязала сяброў арганізацыі збіраць фальклор падчас летніх вакацый у Латгаліі, а Ф. Клагішу быў даручаны фанограф[412]. Адным з першых вынікі сваёй працы прадставіў Ф. Клагіш, які перадаў таварыству 12 запісаных казак і прыказак. Народныя казкі дасылалі ў таварыства з Дзвіншчыны: А. Сальцэвіч (*Дар за дар*), М. Талерка (*Аб добрым краўцу*, *Лёкай*, 11 абрадавых песень), Казімір Сянкевіч (*Вясельныя спевы і звычаі ў Пустыншчыне*, *Вясельныя спевы і звычаі ў Прыдруйшчыне*, *Вясельныя спевы і звычаі ў Даўгаўпілшчыне*); з Лудзеншчыны: С. Маціеўскі (*Як чорт мужыку брыль грошы прыносіў*), Г. Нікіфароўская (*Беларускія прыпеўкі з Істрэнскай воласці*), М. Зуеўскі (*Вясельныя спевы ў Пасіеншчыне*), А. Лейтан (*Як жонка мужыка б'ець*, *Якая бяда, калі п'ецца вада*)[413]. У 1933 г. настаўніцы Г. Нікіфароўская і Н. Нікіфароўская запісалі ў Старой Слабадзе 44 песні, С. Казека (у Звірдзеншчыне) – 10 вясельных песняў, М. Шчавінскі (у Канецполю) – 8 побытавых песень, Ігнат Ігнатовіч (на Пустыншчыне) – некалькі жартоўных казак[414]. Істотны ўклад у збіранне народнай творчасці зрабіў калектыў настаўнікаў і вучняў Даўгаўпілскай беларускай гімназіі на чале з С. Сахаравым і А. Якубецкім. Яны запісалі і перадалі БНКТЛ некалькі дзясяткаў народных твораў[415]. Зборам этнаграфічнага матэрыялу займаліся як шараговыя сябры і прыхільнікі таварыства, так і яго кіраўнікі. Улетку

---

[411] LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 64 lp.

[412] LVVA, 1897 f., 1 ap., 2 l., 55 lp.

[413] *Зьбірайце беларускія народныя творы у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 1(18), с. 261; LVVA, 1897 f., 1 ap., 2 l., 48 lp.

[414] *У Латвіі*, "Родны край" № 18 ад 2 верасня 1933 г., с. 5–6.

[415] *Праца Беларускага Навукова-Краязнаўчана Т-ва*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 6(23), с. 342.

1933 г. К. Езавітаў запісаў у Істэрскай воласці 14 купальскіх спеваў і 2 казкі, а Надзея Нікіфароўская – 6 песняў[416]. Працу па зборы вуснай народнай творчасці належыць лічыць плённай і паспяховай. За тры гады краязнаўчай працы было сабрана больш за 600 народных песень і 70 апавяданняў[417].

25 кастрычніка 1933 г. праўленне таварыства вырашыла звярнуцца да Культурнага фонду Латвіі з просьбай вылучыць сродкі на друк зборніка беларускай народнай творчасці Латгаліі[418]. Матэрыялы краязнаўчай праблематыкі друкаваліся таксама на старонках выданняў "Голас беларуса" і "Беларуская школа ў Латвіі"[419].

Акрамя вуснай творчасці БНКТЛ цікавіла матэрыяльная культура латвійскіх беларусаў (вопратка, прадметы хатняга ўжытку). Вёўся збор рэчаў, якія потым планавалася перадаць у Латвійскі этнаграфічны музей у Рызе[420]. Паводле дамоўленасці паміж таварыствам і дырэкцыяй установы ў Прэждэнскім замку планавалася стварыць беларускі куток пры ўмове, што туды трапіць не менш як некалькі дзясяткаў экспанатаў. Праўленне БНКТЛ заклікала грамадскасць ахвяраваць і збіраць матэрыялы[421]. Праўда, збор рэчаў ішоў не так паспяхова, як збор вуснай народнай творчасці. Тым не менш, вядома, што сябра арганізацыі М. Краўчанка сабраў матэрыял аб вопратцы, рэчах і абрадах беларусаў Істэршчыны. На пасяджэнні праўлення БНКТЛ 9 жніўня 1933 г. было вырашана звярнуцца ў БША з просьбай пазычыць фотаапарат, каб зафіксаваць рэчы, вопратку і абрады латгальскіх беларусаў[422].

Этнаграфічная праца БНКТЛ была важным, але не адзіным напрамкам дзейнасці арганізацыі. Таварыства ажыццяўляла і іншую актыўнасць. 11 кастрычніка 1932 г. кіраўніцтва БНКТЛ вырашыла, што К. Езавітаў прачытае тры даклады (*Янка Купала і беларускае адраджэнне*, *Якуб Колас у беларускай літаратуры*, *80 год беларускага тэатра і Уладзіслаў Галубок*) на ўрачыстасцях, зладжаных беларускімі арганізацыямі і школамі ў Рызе. Па ініцыятыве К. Езавітава было прапанавана пасылаць з лекцыямі і ў правінцыю, калі б адтуль прыходзілі запрашэнні[423].

Старшыня арганізацыі прапанаваў пачаць збор дакументаў і матэрыялаў па гісторыі беларускага нацыянальнага руху. 13 жніўня 1932 г. часовае

---

[416] LVVA, 1897 f., 1 ap., 2 l., 57 lp.; *Праца Беларускага Навукова-Краязнаўчага Таварыства ў Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 5(22), с. 323.

[417] LCVA, f. 368, ap. 1, b. 34, l. 6.

[418] LVVA, 1897 f., 1 ap., 2 l., 59 lp.

[419] *Крывіцкія руны. Вып. II: Беларускі культурны мацярык у Латвіі*, рэд. М. Казлоўскі, С. Панізнік, Менск 2017, с. 447–448.

[420] LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 64 lp.

[421] LVVA, 1897 f., 1 ap., 2 l., 38. lp.

[422] LVVA, 1897 f., 1 ap., 2 l., lp. 57.

[423] LVVA, 1897 f., 1 ap., 2 l., 16 lp.

праўленне арганізацыі вырашыла звярнуцца да сваякоў Яўгена Ладнова з просьбай падзяліцца ўспамінамі і матэрыяламі пра памерлага[424]. Па даручэнні кіраўніцтва БНКТЛ А. Ціхаміраў скантактаваўся з братам Я. Ладнова ў справе атрымання архіву нябожчыка. У выніку ўдалося здабыць некаторыя рэчы памерлага, у тым ліку дыпламатычны пашпарт БНР[425]. Апрача таго, таварыства мела намер з дапамогай Міколы Вяршыніна з Прагі сабраць разам увесь архіў Я. Ладнова, які, паводле сцвярджэння К. Езавітава, быў параскіданы па Варшаве, Берліне, Данцыгу і Парыжы[426]. У студзені 1933 г. К. Езавітаў сустрэўся з Рызе з братам Я. Ладнова, які працаваў рабочым на чыгунцы. Брат паведаміў, што ўсе архівы Я. Ладноў пакінуў у жонкі ў Парыжы, а з сабой у Даўгаўпілс прывёз толькі французскамоўны асобнік кнігі *Агнём і мячом, голадам і хваробамі* (Варшава, 1922), некалькі лістоў і паштовыя квіткі[427]. Таварыства таксама спрабавала сабраць звесткі пра заўчасна памерлага беларускага пісьменніка і нацыянальнага актывіста Віктара Вальтара і яго пражскі перыяд жыцця[428].

У жніўні 1932 г. кіраўніцтва БНКТЛ звярнулася да мужа Алаізы Пашкевіч Сцяпонаса Кайрыса з просьбай даслаць архіўную спадчыну нябожчыцы і падзяліцца ўспамінамі пра яе[429]. З адпаведнай просьбай таварыства звярнулася да Ганны Шалінай сястры празаіка і літаратуразнаўцы Сяргея Палуяна[430]. Акрамя таго, таварыства кантактавала з адвакатам Сігізмундам Шаўлоўскім і роднымі Браніслава Эпімах-Шыпілы з просьбай даць звесткі пра беларускіх адраджэнцаў пецярбургскага перыяду (Вацлава Іваноўскага, Браніслава і Уладзіслава Эпімах-Шыпілаў, Яўхіма Карскага)[431].

Праўленне 25 жніўня 1932 г. ухваліла ідэю падрыхтаваць і выдаць біяграфічны слоўнік пад рабочай назвай *Біяграфіі дзеячаў Беларускага Адраджэння*. У выданне мусіла трапіць інфармацыя пра найбольш значных асоб. З гэтай мэтай К. Езавітаў заклікаў беларускіх паэтаў, грамадскіх дзеячаў, настаўнікаў, артыстаў і іншых дасылаць на адрас БНКТЛ аўтабіяграфіі і біяграфіі, а таксама фотаматэрыялы[432].

---

[424] LVVA, 1897 f., 1 ap., 2 l., 10 lp.

[425] LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 16, 24, 25 lp.

[426] LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 71 lp.

[427] 5 студзеня 1933 г. праўленне таварыства вырашыла паспрабаваць вызначыць кола асоб, з якімі Я. Ладноў утрымліваў карэспандэнцыйную сувязь, каб даведацца хто можа мець яго архівы . LVVA, 1897 f., 1 ap., 2 l., 44 lp.

[428] LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 73 lp.

[429] LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 26–27 lpp.

[430] LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 39 lp.

[431] LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 35, 41 lpp.

[432] К. Езавітаў, *Беларускае Культурна-Асьветнае Т-ва "Бацькаўшчына" ў Латвіі*, Рыга 1932, с. 26; *Да усіх беларускіх нацыянальна-адраджэнчых дзеячоў працаунікоу беларускае літаратары,*

З аналізу даступных крыніц вынікае, што гэты заклік не меў водгуку ў шырэйшага кола беларускіх дзеячаў і аўтары праекту былі вымушаны адмовіцца ад задумы. Нягледзячы на гэта, таварыства падтрымлівала актыўныя кантакты з беларускімі дзеячамі за межамі Латвіі. У першую чаргу варта ўзгадаць Васіля Захарку, Міколу Вяршыніна і Міколу Матача. У верасні 1932 г. праўленне таварыства заклікала іх далучыцца да арганізацыі ў якасці сяброў-карэспандэнтаў[433]. Першым двум прапанавалі рыхтаваць агляды беларускага жыцця ў Празе[434]. У выпадку М. Вяршыніна задума прынесла пэўны плён, бо дзеяч пагадзіўся супрацоўнічаць з арганізацыяй. Старшыня БНКТЛ прасіў яго падзяліцца ўспамінамі пра беларусаў у Рызе ў часы, калі М. Вяршынін вучыўся ў мясцовай політэхніцы[435]. Прапанову далучыцца да працы БНКТЛ атрымаў і яшчэ адзін пражскі беларус – Тамаш Грыб, які ў снежні 1932 г. пагадзіўся стаць сябрам-карэспандэнтам[436]. 18 кастрычніка 1932 г. кіраўніцтва БНКТЛ запрасіла да ўдзелу ў працы таварыства чыкагскага беларуса Язэпа Варонку прапануючы яму апрацаваць тэму “Беларусы ў Амерыцы” і асвятліць стан іх мовы[437]. Кастусь Езавітаў сцвярджаў, што ўплывы англійскай на мову тамтэйшых беларусаў вельмі цікавіць латвійскіх суайчыннікаў, на гаворку якіх таксама ўплываюць іншыя мовы[438].

З думкай пра захаванне спадчыны адраджэнскага руху 18 верасня 1932 г. на прапанову К. Езавітава кіраўніцтва БНКТЛ пастанавіла заснаваць пры таварыстве беларускі архіў, каб захоўваць матэрыялы, прысвечаныя “беларускаму руху і нацыянальна-адраджэнчай працы паасобных дзеячоў”. Загадчыкам архіва быў прызначаны К. Езавітаў. Апошні пагадзіўся перадаць туды свае ўласныя матэрыялы пры ўмове, што знаёміцца з імі будуць толькі з яго асабістай згоды[439]. Не захавалася звестак, каб нехта перадаў свае зборы на патрэбы архіву. Праўда, у снежні 1932 г. Васіль Захарка даслаў БНКТЛ асобнік мемарандума Прэзідыума Рады БНР у Лігу Нацый ад 20 лістапада 1932 г.[440] Невядома, аднак, чым кіраваўся старшыня Рады БНР, перадаючы гэты дакумент БНКТЛ. Так ці інакш, на пасяджэнні праўлення арганізацыі (21 снежня 1932 г.) было вырашана захаваць дакумент у архіве

школы і тэатру, “Беларуская школа ў Латвіі” 1933, № 2(9), с. 276; *У Латвіі*, “Родны край” № 2 ад 14 студзеня 1933 г., с. 76.

433 LVVA, 1897 f., 1 ap., 2 l., 14 lp.

434 LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 59 lp.

435 LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 87 lp.

436 LVVA, 1897 f., 1 ap., 2 l., 39 lp.

437 LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 80 lp.

438 LVVA, 1897 f., 1 ap., 2 l., 48 lp.

439 LVVA, 1897 f., 1 ap., 2 l., 39 lp.

440 LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 106 lp.

таварыства[441]. Мяркуючы па захаваных крыніцах, гэта быў адзін з нешматлікіх дакументаў пра дзейнасць беларускага руху, які трапіў у архіў БНКТЛ. Задума К. Езавітава стварыць у Рызе "архіў беларускага адраджэння" не была рэалізавана. Верагодна, асноўнай прычынай была адсутнасць сродкаў.

Не была здзейсненая і задума (згодна з ухвалай праўлення ад 9 верасня 1932 г.) стварыць беларускі аддзел у Гарадской дзяржаўнай бібліятэцы[442]. Не ўдалося таксама адчыніць у Рызе беларускі народны ўніверсітэт. У кастрычніку 1933 г. кіраўніцтва арганізацыі планавала атрымаць ад улад дазвол на адкрыццё гэтай установы. Аднак з невядомых прычын справа не выйшла за межы вусных абмеркаванняў з латвійскімі ўрадоўцамі[443].

БНКТЛ намагалася рэагаваць на "антыбеларускія" праявы ў дзейнасці латвійскіх і замежных арганізацый і ўстаноў. Напрыклад, 27 жніўня 1932 г. К. Езавітаў накіраваў ліст галоўнаму рэдактару літоўскай газеты "Mūsų Vilnius", адзін з аўтараў якой выкарыстаў назву "гуды" ў дачыненні беларусаў. На думку кіраўніка БНКТЛ, гэта абражала беларусаў і не адпавядала рэчаіснасці, бо так літоўцы традыцыйна называлі рускіх. К. Езавітаў прасіў надрукаваць у адным з наступных нумароў удакладненне, а беларусаў надалей называць "балтгудамі"[444].

Беларускае навукова-краязнаўчае таварыства супрацоўнічала латвійскімі і замежнымі інтэлектуаламі. Сярод іх быў вышэйзгаданы Баляслаў Брэжга, даследчык мінуўшчыны Віцебшчыны і Полаччыны. Навуковец кіраваў археалагічнай экспедыцыяй, якая даследавала руіны полацкага паселішча Герцыке[445]. Гэты чалавек перадаў у бібліятэку таварыства шэраг гістарычных прац з уласнага кнігазбору[446]. Да ліку замежных навукоўцаў, з якімі трымала сувязь кіраўніцтва БНКТЛ, належаў літоўскі гісторык літаратуры і культуры Міколас Біржышка (*Mykolas Biržiška*). 25 жніўня 1932 г. праўленне таварыства пастанавіла выслаць віншавальную тэлеграму навукоўцу з нагоды яго 50-годдзя[447]. З БНКТЛ кантактаваў эстонскі моваznавец, дацэнт Тартаускага ўніверсітэта Віллем Эрнітс (*Villem Ernits*), які ў 1932 г. у сваім ВНУ ініцыяваў тэарэтычныя курсы беларускай мовы. Улетку 1932 г. ён наведаў Латгалію з мэтай вывучэння мясцовай беларускай культуры. Кіраўніцтва БНКТЛ звярталася тады да беларускай інтэлігенцыі з просьбай "*дапамагчы г-ну В. Эрнітсу ўсім, чым зможаце, каб яго паездка дала добрыя вынікі для*

---

[441] LVVA, 1897 f., 1 ap., 2 l., 40 lp.

[442] LVVA, 1897 f., 1 ap., 2 l., 13 lp.

[443] LVVA, 1897 f., 1 ap., 2 l., 59 lp.

[444] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 28, л. 1; LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 41 lp.

[445] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 134, л. 56.

[446] LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 11 lp.

[447] LVVA, 1897 f., 1 ap., 2 l., 18 lp.

вывучэння нашага народа"[448]. Старшыня таварыства выслаў В. Эрнітсу 20 асобнікаў кнігі *Беларусь у мінулым і сучасным*, а таксама заклікала кіраўніцтва іншых беларускіх арганізацый і настаўніцкіх курсаў дапамагчы эстонскаму славісту літаратурай, неабходнай для правядзення курсаў беларускай мовы. Больш за тое, К. Езавітаў перадаў яму ўласныя канспекты і напрацоўкі[449]. Адначасова БНКТЛ прасіла В. Эрнітса падзяліцца звесткамі пра беларускія гаворкі на Пячоршчыне[450].

Візіт В. Эрнітса ў Латгалію стаў для кіраўніцтва БНКТЛ нагодай усталяваць сувязь з эстонскімі беларусамі[451], у прыватнасці з Міколам Чарвяковым. Кіраўнік БНКТЛ намагаўся атрымаць ад яго звесткі пра стан беларусазнаўчых даследаванняў у Эстоніі. 30 жніўня 1932 г. К. Езавітаў прасіў паведаміць яму, як эстонцы называюць беларусаў, якія працы, прысвечаныя беларусам, пабачылі свет у гэтай краіне і ці нехта даследуе гісторыю, мову і літаратуру Беларусі[452]. 30 жніўня 1932 г. кіраўніцтва БНКТЛ звярнулася да дырэктара гімназіі ў Лаўры з просьбай "*дапамагчы (...) у справе навязання кантакту з эстонскімі грамадсзімі і навуковымі коламі, каб наладзіць справу інфармавання эстонцаў аб беларусах*"[453]. Акрамя таго,

---

[448] LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 13 lp. 20 ліпеня 1932 г. К. Езавітаў пісаў У. Ціхаміраву: "*Трэба пазнаёміць яго ў Дзвінску з Сяргеем Пятровічам, гр. Раткіным і іншымі беларусамі, а таксама з Клагішамі і гр. Казлоўскім, калі яны зара ёсць на курсах латышскае мовы ў Дзвінску. Трэба, каб яны паказалі гр.В.Эрнітсу беларускую вёску і беларускае жыхарства і каб ад гэтага знаёмства асталіся і добрыя ўражанні, і навуковыя веды. Вельмі Вас прашу паказаць грамадзяніну Беларускую гімназію і абавязкова выклікаць гр.Сахарава, калі ён на дачы. Калі ёсьць на курсах гр.Талерка, дык пазнаёмце і ім, ды наогул з нашым свядомым настаўніцтвам. Майце на ўвазе, што гр. В.Эрнітс яшчэ і літаратурны працаўнік, дык знаёміць яго з негатыўнымі элементамі не варта*" (LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 14 lp.).

[449] LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 55, 56 lp.

[450] LVVA, 1897 f., 1 ap., 2 l., 10 lp.

[451] У лісце да Міколы Чарвякова (4 жніўня 1932 г.) ён заклікаў тамтэйшых беларусаў арганізавацца і працаваць на карысць навукі: "*Да нас у Рыгу і ў Латгалію прыязджаў прыват-дацэнт Тартаўскага Эстонскага Дзяржаўнага Універсітэта, гр. Віллем Эрнітс, які зара працуе над доследамі беларускае мовы. Ён паведаміў нам, што ў Пячоршчыне знайшоў даволі многа беларусаў, але што яны цалком апанаваны расейскімі ўплывамі. Ён надзвычайна сумаваў і казаў, што з вялікаю ахвотаю падтрымаў бы беларусаў, калі б у Рэвелі заклалася сапраўднае беларускае культурна-асветнае Т-ва, хаця ж бы і з невялічкім спачатку ядром дзеячоў, але свядомых з боку нацыянальнага. Гэта Т-ва, маючы 5–8 свядомых беларускіх інтэлігентаў і рабочых, магло б распачаць працу затым і ў Пячоршчыне сярод беларускага сялянства. Гр. В. Эрнітс хутка паедзе ў Пячоршчыну збіраць матэрыялы. Магчыма, што перад гэтым ён заедзе спачатку да Вас, каб пагутарыць. Было б добра, каб і Вы праехаліся па Пячоршчыне і завязалі першыя знаёмствы. Гэта дало б магчымасць нам прасачыць: ці ясна вызначаны ў Пячоршчыне беларускія адзнакі і элементы беларускае мовы. Гэтым Вы саслужылі б вялікую справу нашаму Т-ву і беларускай навуцы*". LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 16 lp.

[452] LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 48 lp.

[453] LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 52 lp.

кіраўніцтва БНКТЛ распачало перапіску з эстонскімі навукоўцамі, якія ўдзельнічалі ў кангрэсах навукоўцаў Балтыі. 30 жніўня 1932 г. К. Езавітаў скіраваў ім калектыўны ліст, у якім прасіў паінфармаваць пра стан беларускіх даследаванняў. У прыватнасці, ён цікавіўся, ці існуюць пераклады з беларускай мовы на эстонскую[454]. Сціпласць захаваных крыніц па дадзенай тэме дазваляе меркаваць, што згаданыя кантакты мелі, аднак, эпізадычны характар.

Больш інтэнсіўныя кантакты БНКТЛ падтрымлівала з заходнебеларускімі арганізацыямі, якія мелі падобныя мэты – Таварыствам беларускай школы, Беларускім інстытутам гаспадаркі і культуры, Беларускім навуковым таварыствам, рэдакцыямі часопісаў "Шлях моладзі" і "Самапомач" (рэд. Адольф Клімовіч). Існавалі таксама кантакты паміж БНКТЛ і Беларускім культурна-асветным таварыствам у Літве. У лісце кіраўніку гэтай арганізацыі Антону Матачу (6 жніўня 1932 г.) старшыня БНКТЛ пісаў: "*Беларускае Навукова-Краязнаўчае Т-ва ў Латвіі звяртаецца да Вас з вялікай просьбай ці не зоймецеся Вы справай збірання твораў беларускае народнае творчасці ў Літве, спачатку ў Вашым раёне, а затым і ў Нова-Аляксандраўшчыне. Беларускай навуцы якраз вельмі бракуе даных з гэтых раёнаў, а яны надзвычайна цікавыя, бо тутака ёсць асаблівасці нашае мовы, якія, як пераходныя і прымежныя да літоўскае мовы, нідзе больш не назіраюцца. Усе надасланыя матэрыялы мы паступова будзем друкаваць у штомесячніку 'Беларуская школа ў Латвіі' і рабіць асобныя адбіткі*"[455]. Аднак супрацоўніцтва паміж арганізацыямі на практыцы абмяжоўвалася спарадычнымі кантактамі. Старшыня БНКТЛ ліставаўся з прадстаўнікамі Савецкай Беларусі: рэдакцыяй дзіцячага часопіса "Заранка" і кіраўніцтвам Беларускай акадэміі навук. У апошнім выпадку кіраўнік таварыства прасіў наладзіць абмен навуковай літаратурай. У прыватнасці, К. Езавітаў прасіў выслаць праграмы і інструкцыі па збіранні вуснай народнай творчасці[456].

З аналізу ўнутранай дакументацыі БНКТЛ вынікае, што да ліку "партнёрскіх" арганізацый і асоб таварыства залічваліся: Аб'яднанне славянскіх таварыстваў у Заграбе, Беларуская дзяржаўная бібліятэка, доктар В. Кісялёўскі ў Лондане, Беларускі музей ў Вільні, праф. Павел Растаргуеў у Маскве, Віленская беларуская гімназія, праф. Юзэф Галомбэк у Варшаве і іншыя. Кіраўніцтва БНКТЛ планавала ўсім вышэйпералічаным установам і асобам рэгулярна высылаць свае выданні[457]. Відавочна, аднак, што кантакты са значнай часткай адрасатаў былі эпізадычныя.

---

[454] LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 53 lp.

[455] LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 23 lp.

[456] LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 16, 21, 78 lpp.

[457] LVVA, 1897 f., 1 ap., 2 l., 12 lp.

З таварыствам перапісваўся Эдмунд Зуземіль з Кёнігсберга. Нягледзячы на тое, што яго кантакты з латвійскімі беларусамі не былі насычанымі, яны заслугоўваюць дэталёвага разгляду з прычыны іх спецыфікі. У 1930 г. Э. Зуземіль абвясціў конкурс на найлепшы беларускі гістарычны раман, прысвечаны падзеям 17 ст., вызначыўшы ўзнагароду ў памеры ад 5 тыс. да 1 тыс. польскіх злотых за чатыры найлепшыя творы. Тады некаторыя дзеячы беларускага руху ў Латвіі зацікавіліся прапановай. Аднак далей словаў справа не пайшла[458]. Праз два гады Э. Зуземіль сам даслаў кіраўніку з БНКТЛ некалькі фота беларускіх сялян з Усходняй Прусіі. Яго прапанова супрацоўнічаць выклікала недавер у кіраўніцтва БНКТЛ, бо ў лістах аўтар называў сябе ўдзельнікам беларускага руху і "бацькам радзіміцкага руху"[459]. Кіраўнік таварыства К. Езавітаў запатрабаваў ад Э. Зуземіля ўдакладніць, калі і ў якіх акалічнасцях ён удзельнічаў у беларускім руху і на якой падставе называе сябе "бацькам радзіміцкага руху". Э. Зуземіль патлумачыў, што нямецкі ўрад тытулуе яго "каралём радзімічаў". У сувязі з гэтым К. Езавітаў звярнуўся ў Беларускае навуковае таварыства ў Вільні з просьбай даць больш інфармацыі пра Э. Зуземіля. Неўзабаве лідар латвійскіх беларусаў атрымаў адказ Антона Луцкевіча, які паведамляў, што падчас I сусветнай вайны Э. Зуземіль быў нямецкім шпіёнам у Расіі і займаў пасаду настаўніка рэальнай школы ў Пінску, а беларускай справе толькі шкодзіў. На пасяджэнні 15 лістапада 1932 г. праўленне БНКТЛ вырашыла не ўступаць з Э. Зумемілем у бліжэйшыя кантакты[460]. Незалежна ад Э. Зуземіля з БНКТЛ скантактаваўся Нікіфар Костачка з Данцыга, які праяўляў цікавасць да беларускага жыцця ў Латвіі. 15 лістапада 1932 г. кіраўніцтва таварыства папрасіла яго даць звесткі пра беларусаў у Данцыгу і прапанавала заснаваць у горадзе беларускае таварыства. З нявысветленых прычын гэтая справа аднак не атрымала працягу[461].

Выдавецкая дзейнасць БНКТЛ будзе разгледжаная падрабязна ў падраздзеле, прысвечаным выдавецкай актыўнасці беларусаў Латвіі. Аднак зараз варта адзначыць, што БНКТЛ не мела ўласнага перыёдыка, таму карысталася старонкамі штомесячніка "Беларуская школа ў Латвіі". На старонках гэтага выдання друкаваліся вынікі палявой этнаграфічнай працы.

---

458 LVVA, 1747 f., 1 apr., 25 l., 55 lp.

459 LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 70, 84, 85 lpp.

460 LVVA, 1897 f., 1 ap., 2 l., 37 lp.

461 LVVA, 1897 f., 1 ap., 2 l., 37 lp.

Моладзевы і студэнцкі рух

Адной з праяў беларускай нацыянальнай актыўнасці ў Латвіі быў моладзевы рух. Удзел моладзі ў нацыянальна-культурным жыцці стаў магчымы ў 2-й палове 1920-х гг. У гэты час першыя выхаванцы Даўгаўпілскай беларускай гімназіі актыўна ўключыліся ў нацыянальную працу і пачалі самастойную дзейнасць на культурна-асветнай ніве. Першыя спробы стварыць беларускую моладзевую арганізацыю датуюцца сярэдзінай 1920-х гг. Тады ў Рызе спрабавалі заснаваць Аб'яднанне крыўскай моладзі імя Максіма Багдановіча. Ініцыятарамі былі А. Сальцэвіч і П. Масальскі, якія распрацавалі статут. Аднак з фінансавых прычын арганізацыя не былы створана[462].

У наступныя гады ініцыятыву па арганізацыі моладзевага руху праявілі студэнты. 28 сакавіка 1927 г. Аб'яднанне беларускіх студэнцкіх арганізацый у Празе выслала на імя "Беларускай студэнцкай арганізацыі" ліст з просьбай даць звесткі пра склад яе кіраўніцтва і колькасці сяброў. Імаверна, пражскія беларусы лічылі, што ў Латвіі існуе студэнцкая арганізацыя[463]. Аднак іншыя крыніцы гэтага не пацвярджаюць. Толькі 25 красавіка 1928 г. у Рыза было створана **Таварыства беларускай моладзі ў Латвіі (ТБМЛ).** Сядзіба ТБМЛ знаходзілася ў будынку 1-й Рыжскай беларускай школы. На жаль, не захаваўся архіў арганізацыі, таму звесткі пра як дзейнасць і асабовы склад даследчыкі мусяць шукаць у прэсе і дакументацыі іншых беларускіх устаноў. Вядомы склад першай управы ТБМЛ: Пятро Журкоўскі (старшыня), Ніна Пінская (сакратар), Казімір Мяжэцкі, Пятро Мірановіч і Міхась Калінін. У крыніцах захаваліся звесткі і пра склад кіраўніцтва ТБМЛ, абранага ўвесну 1933 г.: Казімір Мяжэцкі (старшыня), Пятро Мірановіч (намеснік старшыні), Франц Клагіш (сакратар), Міхась Зуеўскі (намеснік сакратара) і Язэп Клагіш (скарбнік)[464]. Акрамя таго, да ліку актыўных сяброў арганізацыі належалі Караль Казакевіч, Язэп Каяла, Франц Клагіш, Язэп Клагіш, Вераніка Слосман і Вера Бялінская.

Згодна са статутам, арганізацыя мела на мэце "*аб'яднаць усю беларускую моладзь, спагадаць прасвеце моладзі, выпрацоўваць у яе крытычны погляд на рэчы і самастойнасць, эстэтычны густ, зносьць да чужога пераканання, дбаць аб фізічным выхаванні моладзі, абуджаць каханне да працы (...) дбаць аб развітку самадзейнасці, абарона гаспадарчага і праўнага становішча*

---

[462] А. Горны, *Алесь Сальцэвіч – невядомы дзеяч беларускай меншасці ў Латвіі ў міжваенны перыяд* [у:] *Гісторыя Беларусі ў XX стагоддзі. Памяці прафесара Івана Коўкеля*, рэд. А. Горны, Гродна 2017, с. 215.

[463] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 71 lp.

[464] *З жыцьця Беларускае Моладзі у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 5(22), с. 334; *У Латвіі*, "Родны край" 1933, № 18 ад 2 верасня, с. 5.

моладзі, клопат аб моладзі з боку дзяржавы, знішчэнне алкаголю і нікатыны сярод моладзі, звязак моладзі з іншай Латвійскай і міжнародавай моладдзю, пашырэнне вестак аб руху беларускага народа ў міжнародавай прэсе"[465].

Стварэнне беларускай моладзевай арганізацыі было натуральным працэсам "нацыянальнага саспявання" беларускай меншасці. Яно было абумоўлена ўключэннем у нацыянальна-культурнае жыццё маладога пакалення латвійскіх беларусаў. Вось як абгрунтоўвалі патрэбу арганізацыйнай працы сярод беларускай моладзі заснавальнікі ТБМЛ: "*Гісторыя часу даказвае нам, што моладзь займае ў палітычным, грамадскім і культурным жыцці моцнае становішча, што яна адвечна была тым імпульсам, тым актывам, які накіроўваў жыццё наперад. Даводзіць гэта не патрэбна, ведаючы тую моц, тую энергію, з якой ідзе яна праз крыжовыя дарогі, праз пераследаванні і ўціскі да новага жыцця (...) зараз перад намі – сучаснай беларускай моладдзю – якая пасля пажару ўсясветнае бойкі апынулася перад голымі руінамі Бацькаўшчыны, паўстае пытанне: з чаго пачаць і якія нашы задачы (…) Мы, беларуская моладзь, стаімо на раскрыжаванні, мы топчамся на адным месцы. Частка моладзі пад уплывам пэўных палітычных абставін, паасобных грамадзян, якія страцілі веру ў памыснасць працы і пачынаюць ставіць справу асабістую, альбо матэрыяльную, вышэй за агульнаграмадскую і нацыянальную, якраз паддалася гэтаму цячэнню, у той час калі перад намі ляжыць вялікая адказная праца. Прыйшоў час, калі беларуская моладзь павінна скінуць з сябе ўсё тое благое, тую агрубеласць, што пакінулі нам у душы розныя, часам і надта цяжкія, абставіны жыцця, але аб'яднацца і пайсці ў народ і з народам, і паказаць сваю энергію, якая да гэтага немаль спала. Амаль усе мы выйшлі з сялянскага працоўнага народа, усе мы ведаем гаротнае жыццё яго і, носячы ў сабе як перажытае ўвесь цяжар ягонага жыцця – ніколі не зможамо павесці наш народ памылковым шляхам, а гэтае дае нам права стаць правадыром яго. Мы – нарастаючая моц – цвёрда стаючы на грунце барацьбы за лепшую будучыню нашага народа, нашае Бацькаўшчыны, павінны значнае зрабіць у гэтым напрамку. У першую чаргу, атрымліваючы асвету, мы не павінны выракацца свайго народа, як гэта часта рабілася да часу вайны, калі сыны беларускага народа, здабыўшы асвету часта стыдаліся свае мовы, свае нацыі і, часам, выракаліся сваіх бацькоў. Кліч Мацея Бурачка 'Не пакідайце мовы вашай беларускай, каб не памёрлі', павінен стаць нашай пуцяводнай зоркай, бо ён мае сваю гісторыю, навокал якога гуртавалася беларуская інтэлігенцыя (...) Ідучы наперад, нам трэба абапірацца на наша мінулае, якое жыве ў духовым скарбе нашага народа. Таму мы павінны цікавіцца яго мінуўшчынай, збіраць народныя песні, легенды, байкі, пагаворкі, навуковыя матэрыялы,*

[465] LVVA, 2125 f., 5 apr., 13 l., 43 lp.

археалагічныя памяткі (...) Таксама мусімо звярнуць увагу на сваё самавыхаванне, бо нашыя гады – гэта час, калі наймацней, найвыразней, найпаўней укладаецца характар. У сабе мы павінны выхаваць людзей не эгаістаў, не кар'ерыстаў, але тых гуманістаў, якія будуць дбаць аб шчасці і дабры свайго народа і грамадскую нацыянальную справу паставяць вышэй за ўсё. І яшчэ адно і самае галоўнае гэта нацыянальнае ўсведамленне сялянскіх і працоўных беларускіх масаў і, кажучы нацыянальнае, не дай Божа нацыянальна-шавіністычнае, бо здаровае нацыянальнае ўсведамленне беларускага народа ёсць тым часам адзіны пэўны шлях да лепшае долі. Ускладаючы на сябе гэтыя заданні, нам трэба мець асцярогу, каб не пайсці тым шляхам, якім пайшлі нашы ўваскрошаныя браты-народы (калі можам іх назваць братамі). Мы павінны высцерагацца шавіністычнае вопраткі, якая пануе ў нашых суседзяў, але апрануцца ў прыгожае, здарова-нацыяналістычнае адзенне, як было, павінна быць і будзе гордасцю кожнага народа"[466].

Дзейнасць ТБМЛ была скіраваная на працу са студэнтамі, слухачамі беларускіх настаўніцкіх курсаў, вучнямі старэйшых класаў гімназій і пачатковых школ, гарадской і вясковай моладдзю. На пачатку таварыства ахапіла дзейнасцю Лудзеншчыну, дзе ў 1928–1929 гг. было створана 10 рэгіянальных аддзелаў. 15 снежня 1929 г. адбыўся з'езд сяброў ТБМЛ, на якім была абмеркаваная справа пашырэння культурнай працы сярод беларускага насельніцтва. У 1930 г. дзейнасць таварыства пачало распаўсюджвацца на Даўгаўпілшчыну і Рэжыччыну. Існавалі аддзелы ў Зілупэ, Пасіене, Шушках (Шкяўнская воласць), Пустыне, Залессі, Прыдруі і г.д.[467] Істотную ролю ў стварэнні рэгіянальных аддзелаў і колаў адыграла вясковае настаўніцтва. Напрыклад, 10 чэрвеня 1929 г. кіраўнік Залескай школы Еўдакім Красцьянцаў прасіў інспектара беларускіх школ даслаць статут і інструкцыі пра абавязкі сяброў ТБМЛ, бо на 16 чэрвеня ў школе быў запланаваны арганізацыйны сход будучага гуртка таварыства[468]. Напрыканцы жніўня 1931 г. адбыўся чарговы з'езд сяброў ТБМЛ, на якім было вырашана ахапіць дзейнасцю таксама Ілукшчыну. Праўда, у гэтай правінцыі не ўдалося стварыць рэгіянальных структур[469].

У 1933 г. ТБМЛ налічвала 14 аддзелаў, якія існавалі на Даўгаўпілшчыне, Рэжыччыне, Лудзеншчыне і ў Рызе. Паводле кіраўніцтва таварыства, у гэты час да яго належала 760 сяброў. Геаграфія выглядала наступным чынам: на Даўгаўпілшчыне – 5 аддзелаў (Пустынскі – 119 чал., Прыдруйскі – 44, Макняўскі – 25, Бельскі – 17, Кузьмінскі – 14), на Лудзеншчыне – 8 аддзелаў

---

[466] *Нашы заданьні*, "Пагоня" 1930, № 1, с. 4.

[467] *Хроніка*, "Пагоня" 1930, № 1, с. 12.

[468] LVVA, 2125 f., 1 apr., 83 l., 15 lp.

[469] *Зьезд беларускай моладзі*, "Беларускае слова" 1931, № 1, с. 4.

(Зілупскі – 117, Пасіенскі – 88, Шушкаўскі – 71, Рудніцкі – 61, Ляўдарскі – 45, Путыняўскі – 25, Лудзенскі – 32, Пылдзенскі – 20), на Рэжыччыне – 1 (Панаўскі – 29). Адным з самых шматлікіх з'яўляўся аддзел у Рызе, які налічваў 82 чал.[470] На пачатку 1934 г. у Рызе (на Маскоўскім Фарштаце) быў створаны яшчэ адзін аддзел ТБМЛ (старшыня Я. Клагіш) з 25 сяброў[471].

Як арганізацыя культурна-асветнага характару ТБМЛ мела права ствараць і ўтрымліваць бібліятэкі і чытальні, клубы, музей, ажыццяўляць палявыя практыкі, арганізоўваць хоры, аркестры, драматычныя трупы і скаўцкія гурткі. Статут прадугледжваў магчымасць ладзіць публічныя лекцыі на навуковыя, грамадска-палітычныя, эстэтычныя і філасофскія тэмы. Апошні пастулат быў уведзены з думкай аб самаўдасканаленні ўдзельнікаў таварыства, "*даючы магчымасць красамоўства і прызвычайваць сяброў да [таго, каб] смела выказваць свае думкі*"[472]. Была створаная рэдакцыйна-навуковая секцыя, што ў выходныя ладзіла ў Рызе і ў правінцыі лекцыі. У якасці лектараў запрашалі як сяброў таварыства, так і гасцей з ліку вядомых грамадскіх дзеячаў (напрыклад С. Сахараў)[473].

Асноўнай крыніцай фінансавання ТБМЛ былі дзяржаўныя датацыі, якія арганізацыя атрымлівала па лініі Беларускага школьнага аддзела і Культурнага фонду Латвіі. За атрыманыя ў 1933 г. грошы (1 200 латаў) пры некаторых аддзелах былі створаны бібліятэчкі. Дадатковы прыбытак таварыству прыносілі сяброўскія складкі і ахвяраванні прыватных асоб.

У першыя гады існавання арганізацыя магла пахваліцца значнымі вынікамі. Асабліва гэта датычыць арганізацыі культурных мерапрыемстваў: канцэртаў і тэатральных пастановак. У тагачаснай беларускай прэсе захаваліся водгукі пра дзейнасць асобных аддзелаў па арганізацыі музычных вечарын і спектакляў. Карэспандэнт газеты "Думка беларуса" пісаў, што вясковая моладзь ахвотна гарнулася да таварыства і цікавілася яго справамі. У прыватнасці адзначалася, што значную працу праяўляў Шылаўскі аддзел ТБМЛ, які ўвесну 1930 г. зладзіў шэраг вечарын і спектакляў[474]. Арганізацыю хваліў К. Езавітаў, які наведваў мерапрыемствы ТБМЛ у Цуцурках (9 чэрвеня) і Шушкаве (10 чэрвеня), дзе ставілі п'есы *Суд* і *Апошняе спатканне*. Асабліва беларускі дзеяч адзначаў добрую ігру акцёраў гуртка ТБМЛ у Шушкаве,

---

[470] *З жыцьця Беларускае Моладзі у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 5(22), с. 334; *У Латвіі,* "Родны край" 1933, № 18 ад 2 верасня, с. 5.

[471] LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 33 lp.; *З жыцьця Беларускае Моладзі у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1934, № 7(24), с. 370.

[472] LVVA, 2125 f., 5 ap., 13 l., 43 lp.

[473] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 94, л. 8.

[474] В. Сьлядзь, *Праца Шылаўскага гуртка белар. моладзі*, "Наша доля" 1930, № 4 ад 8 красавіка, с. 3.

якім кіраваў Антон Лейтан[475]. Апошні звярнуўся да К. Езавітава з просьбай дапамагчы атрымаць згоду МУС на пастаноўку забароненай мясцовымі ўладамі п'есы *Перамога*[476].

Частку тэатральных мерапрыемстваў ТБМЛ ладзіла супольна з Беларускім тэатральным таварыствам у Латвіі[477]. Напрыклад, 27 ліпеня 1930 г. у Зілупе намаганнямі двух арганізацый была пастаўленая п'еса *Раскіданае гняздо*[478]. 13 студзеня 1931 г. ТБМЛ звярнулася да БТТЛ з прапановай паставіць 1 лютага п'есу *Пан міністр* падчас вечарыны таварыства ў Лудзы[479]. Вядома, што намаганнямі Пустынскага аддзелу 26 красавіка 1931 г. у мястэчку была пастаўлена п'еса *Конскі партрэт* і прачытаны рэферат Ф. Клагіша *Становішча беларусаў у Латвіі*. 24 траўня гэты ж аддзел зладзіў вечарыну, падчас якой паказалі п'есу У. Галубка *Суд*. За выручку з мерапрыемства была набытая літаратура і афармленая падпіска на беларускія выданні[480]. 20 верасня 1931 г. у Індры Прыдруйскі аддзел паставіў камедыі *Чорт у бочцы* і *Міхалка*[481]. Тым часам намаганнямі Шушкаўскага аддзела ў 1933 г. была пастаўленая п'еса Я. Купалы *Раскіданае гняздо*[482]. Улетку 1933 г. кіраўніцтва ТБМЛ абавязала кожны рэгіянальны аддзел далучыцца да падрыхтоўкі спектакляў. У сезоне 1932/33 гг. намаганнямі ТБМЛ ставіліся пераважна п'есы Ф. Аляхновіча *У кавалёвай хаце*, *Боты*, *Збянтэжаны Саўка*, *Калісь*, *Дзядзька Якуб*. У якасці рэжысёра выступіў У. Пігулеўскі[483]. Увесну 1933 г. тэатральную і культурна-асветную дзейнасць у латгальскай вёсцы праводзілі Лудзенскі, Пустынскі і Бельскі аддзелы. Пры Пустынскім аддзеле ў 1933 г. быў створаны хор (дырыжор Цаўнэ)[484].

Паводле інфармацыі кіраўніцтва ТБМЛ, у 1928–1933 гг. таварыства зладзіла каля 100 спектакляў і канцэртаў, арганізавала звыш 30 публічных лекцый. У складзе таварыства існавалі тры струнныя аркестры, арганізацыя мела пяць радыёапаратаў[485].

Таварыства ўдзельнічала ў арганізацыі культурна-асветных мерапрыемстваў. У 1929 г. управа ТБМЛ прыняло рашэнне зладзіць у Рызе Дні

---

[475] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 171 lp.

[476] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 172 lp.

[477] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 173 lp.

[478] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 176 lp.

[479] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 16 lp.

[480] *Гурток беларускае моладзі*, "Думка беларуса" 1931, № 1, с. 3.

[481] Юрка, *Моладзь працуе*, "Думка беларуса" 1931, № 5, с. 4.

[482] LCVA, f. 368, ap. 1, b. 33, l. 117; *У Латвіі*, "Родны край" 1933, № 10 ад 13 траўня, с. 5.

[483] *З жыцьця Беларускае Моладзі ў Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 3(20), с. 305; *З жыцьця Беларускае Моладзі у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 6(23), с. 351.

[484] LVVA, 1747 f., 1 apr., 19 l., 171 lp.

[485] *У Латвіі*, "Родны край" № 18 ад 2 верасня 1933 г., с. 5.

беларускай культуры (1-ы дзень – беларускай літаратуры і 2-гі – беларускія спевы і музыка). Кіраўніцтва звярнулася да беларускіх культурна-асветных таварыстваў з прапановай далучыцца да мерапрыемства. На чале аргкамітэта стала Н. Пінская[486]. Улетку 1930 г. Зілупскі і Шушкаўскі аддзелы разам з таварыствам "Беларуская хата" вырашылі зладзіць публічныя курсы па беларусазнаўстве (кіраўнік М. Дзямідаў) для жыхароў навакольных вёсак. Грошы на арганізацыю выдаткаваў БША. Аднак, у сувязі з тым, што правядзенне курсаў было немагчымае ў Зілупе і Шушкаве, было вырашана іх зладзіць у Лудзы. Курсы пачаліся 1 жніўня ў будынку мясцовай беларускай школы, а лекцыі чыталі – М. Дзямідаў (па гісторыі Беларусі і гісторыі беларускай літаратуры) і С. Казека (па геаграфіі Беларусі)[487].

ТБМЛ далучылася да збору сродкаў на стыпендыі для незаможных вучняў Даўгаўпілскай беларускай гімназіі. У 1931 г. з ініцыятывы Прыдруйскага аддзела прайшла дабрачынная вечарына, на якой С. Сахараў прачытаў рэферат прысвечаны 10-годдзю беларускага руху ў Латвіі[488]. Акрамя таго, 12 ліпеня 1932 г. кіраўніцтва аддзелу вырашыла заснаваць тры стыпендыі (па 20 латаў) для пустынскай моладзі – вучняў Даўгаўпілскай беларускай гімназіі. Больш за тое, пустынцы, якія вучыліся ў Даўгаўпілсе, атрымалі ад аддзела па 5 латаў на паездкі дахаты[489]. Добра сябе зарэкамендаваў Пустынскі аддзел. 18 жніўня 1932 г. К. Езавітаў наступным чынам хваліў яго працу: "*Шчыра вітаемо Вас в адкрыццём у Пустыншчыне беларускае бібліятэчкі. Спадзяемся, што яна будзе першым ядром, каля якога згуртуецца тая беларуская грамадскасць, што зможа закласці ў Пустына народны дом. Справа стварэння народных дамоў у Вашым раёне даўно чакае нейкае ініцыятыўнае групы, што ўзялася бы за гэтую вялікую справу. Думаемо, што якраз беларуская моладзь, свядомае і свае нацыянальнасці, і патрэбнасці ў асвеце, зможа нарэшце ўзяцца за здзяйсненне гэтае рэчы*"[490]. 21 жніўня 1932 г. намаганнямі Пустынскага аддзела адбылося ўрачыстае адкрыццё бібліятэкі-чытальні. Перад прысутнымі выступіў С. Сахараў з дакладам "Заданні беларускай моладзі"[491]. Такім чынам, арганізаваная моладзь дапаўняла працу іншых беларускіх культурна-асветных таварыстваў.

Таварыства беларускай моладзі ў Латвіі ўдзельнічала ў зборы этнаграфічнага матэрыялу ў супрацоўніцтве з Беларускім навукова-краязнаўчым

---

[486] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1004 l., 82 lp.

[487] LVVA, 2125 f., 5 ap., 86 l., 66, 69 lpp.

[488] LVVA, 2067 f., 1 ap., 365 l., 50 lp.

[489] С. Сахараў, *Добры прыклад (ліст у рэдакцыю)*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 3(13), с. 188.

[490] LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 34 lp.

[491] LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 33 lp.

таварыствам у Латвіі. Сябры ТБМЛ бралі ўдзел у фальклорных экспедыцыях на Пустыншчыне. Сведчыць пра гэта ліставанне паміж кіраўніцтвам арганізацый. 25 верасня 1932 г. старшыня БНКТЛ пісаў кіраўніку Пустынскага аддзела ТБМЛ Міхалу Клагішу: "*У першую чаргу нас цікавяць народныя спевы і байкі, затым звычаі, назовы геаграфічныя і інш. Калі б Ваш аддзел калектыўна сабраў працу 'Беларускае вяселле ў Пустыншчыне' з усімі спевамі і звычаямі, якія праводзіліся ў часе сватаўства, заручынаў і самаго вяселля, з апісаннем страў, якімі частавалі і вопраткамі, якія надзявалі, і пасагу нявесты і г.д., дык гэта быў бы дужа цэнны ўклад у беларускую навуку. Можна браць і іншыя тэмы: 'Радуніца ў Пустыншчыне', 'Коляды ў Пустыншчыне', 'Талака ў Пустыншчыне' і г.д. Даю Вам толькі прыклады, а Вы самі і Ваш аддзел калектыўна можа намеціць і распрадзяліць між сябрамі паасобныя заданні*"[492].

На прапанову БНКТЛ моладзевыя актывісты ў 1933 г. узялі ўдзел у Тыдні асветы, ініцыяваным Міністэрствам асветы. 15 сакавіка БНКТЛ дэлегавала К. Езавітава прачытаць лекцыю сябрам ТБМЛ і настаўнікам беларускіх школ[493]. Дадаткова актыў ТБМЛ зладзіў у правінцыі шэраг публічных лекцый з удзелам К. Езавітава, К. Мяжэцкага, Я. Кудраўцова, У. Гусарэвіча, Ф. Клагіша і Я. Клагіша. Напрыклад, 19 сакавіка сябра арганізацыі Я. Кудраўцоў прачытаў для жыхароў вёскі Путынава лекцыю "Духоўныя вартасці беларускага і латышскага народаў". Некаторыя лекцыі (у Зілупе, Пустыні, Прыдруйску) збіралі па 200 чал. Заходнебеларускія дзеячы з зайздрасцю пісалі, што "*пажадана было б, каб і ў Заходняй Беларусі наладзіліся супольнымі сіламі ўсяго грамадзянства падобныя 'тыдні' і 'месяцы беларускай асветы*"[494].

Таварыства беларускай моладзі ў Латвіі ўдзельнічала ў арганізацыі нацыянальных свят. Напрыклад, 23 верасня 1933 г. Пустынскі аддзел ТБМЛ зладзіў на паўвыспе возера Вормія вечарыну ў гонар Янкі Купалы. Выступіў хор, чыталі вершы класіка[495]. 25 сакавіка 1933 г. у будынку 1-й Рыжскай беларускай школы кіраўніцтва ТБМЛ зладзіла святкаванне 15-й гадавіны абвяшчэння БНР. Падчас мерапрыемства К. Езавітаў прачытаў рэферат, пасля адбыўся канцэрт. Урачыстасць была спалучана са святкаваннем 25-годдзя педагагічнай працы С. Сахарава, М. Дзямідава, С. Сіцько, Я. Кастылюка і А. Родзькі[496].

ТБМЛ рупілася і пра іншыя бакі жыцця беларускай моладзі. З думкай пра яе фізічнае выхаванне напрыканцы 1932 г. кіраўніцтва таварыства

---

[492] LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 61 lp.

[493] LVVA, 1897 f., 1 ap., 2 l., 52 lp.

[494] LCVA, f. 368, ap. 1, b. 33, l. 37.

[495] *З жыцьця Беларускае Моладзі у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 6(23), с. 350.

[496] LVVA, 2067 f., 1 ap., 365 l., 191 lp.

вырашыла стварыць спартовую секцыю (арганізатары: М. Калінін, Я. Каяла, Я. Кудраўцоў). Секцыя ўзялася за арганізацыю двух футбольных дружын у Рызе (на Маскоўскім Фарштаце і Саркандаўгаве), гуртка лыжнікаў і групы пінг-понгу[497]. У Пустынскім аддзеле ТБМЛ была таксама створана спартовая секцыя (кіраўнік Вігуль), якая займалася арганізацыяй спаборніцтваў (гонак на роварах, футбольных матчаў і інш.) і гімнастычных паказаў[498]. Апрача таго, ТБМЛ давала юрыдычную дапамогу маладым беларусам. Пры цэнтральнай управе існавала бюро даведак і тлумачэнняў, у якое можна было звяртацца ў судовых і банкавых справах[499].

Нягледзячы на актыўнасць ТБМЛ, не ўсе сябры арганізацыі былі задаволеныя яе працай. Так, падчас нарады прадстаўнікоў аддзелаў таварыства на Даўгаўпілшчыне, якая адбылася 25 чэрвеня 1933 г. у Індры, дзейнасць ТБМЛ была прызнаная нездавальняючай. Было вырашана ладзіць кіраўнічыя нарады часцей[500]. 19 лістапада 1933 г. была абрана новая ўправа таварыства. Яе склад быў наступны: К. Мяжэцкі (старшыня), Я. Клагіш (намеснік старшыні), М. Зуеўскі (сакратар), М. Слосман (скарбнік), Браніслаў Станкевіч. У такім складзе кіраўніцтва арганізацыі праіснавала да канца яе дзейнасці[501]. Захавалася няшмат звестак пра працу таварыства пасля 1933 г. Гэта дазваляе меркаваць, што яно не выяўляла значнай актыўнасці.

Разгледзім пытанне ўдзелу прадстаўнікоў беларускай меншасці ў мясцовых ВНУ. Без гэтага гісторыя беларускага моладзевага руху ў міжваеннай Латвіі была б няпоўнай. Аналіз захаваных крыніц дазваляе вызначыць прысутнасць студэнтаў-беларусаў у трох навучальных установах. Найбуйнейшай вышэйшай школай у краіне з'яўляўся Латвійскі ўніверсітэт (*Latvijas Universitāte*), заснаваны ў 1919 г. (у 1919–1923 гг. установа называлася Вышэйшая школа Латвіі, *Latvijas Augstskola*). Галоўная ВНУ Латвіі знаходзілася ў сталіцы. У міжваенны час дзейнічалі наступныя факультэты: архітэктурны, філалагічна-філасофскі, інжынерны, хімічны, агранамічны, матэматычна-прыродазнаўчы, механічны, эканамічна-юрыдычны, багаслоўскі і ветэрынарна-медычны. Адначасова з універсітэтам у Рызе існавалі Латвійская акадэмія мастацтваў (*Latvijas Mākslas akadēmija)* і Латвійская кансерваторыя (*Latvijas Konservatorija*). Нацыянальны склад латвійскага

---

[497] *З жыцьця Беларускае Моладзі у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 1(18), с. 272.

[498] С. Сахараў, *Падтрымаемо беларускую бібліятэку ў Пустыні*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 3(13), с. 181; *Хроніка беларускага жыцьця ў Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 4(14), с. 209; *З жыцьця Беларускае Моладзі у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 6(23), с. 350–351.

[499] *З жыцьця Беларускае Моладзі у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 1(18), с. 272.

[500] *З жыцьця Беларускае Моладзі у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 6(23), с. 350.

[501] LVVA, 3235 f., 5 apr., 1618 l., 2 lp.; *З жыцьця Беларускае Моладзі у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1934, № 7(24), с. 370.

студэнцтва адлюстроўваў этнічную мазаіку грамадства латвійскай дзяржавы. Акрамя латышоў, якія колькасна дамінавалі, у акадэмічных мурах навучаліся прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей. Паводле няпоўных дадзеных у 1929 г., склад студэнтаў-нелатышоў Латвійскага ўніверсітэта выглядаў наступным чынам: 357 немцаў, 139 рускіх, 657 габрэяў, 43 палякі, 22 эстонцы і 13 літоўцаў[502]. У 1937/38 гг. на 6 780 студэнтаў 86% складалі латышы, 6,4% – габрэі, 3,8% – немцы, 2,8% – рускія, 0,4% – палякі, 0,3% – літоўцы, 0,3% – эстонцы і 1% – прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей[503]. Адсутнічаюць дакладныя звесткі наконт колькасці беларусаў, якія з прычыны нешматлікасці трапілі ў апошнюю катэгорыю.

Нязначны працэнт беларусаў сярод студэнтаў належыць тлумачыць аб'ектыўнымі прычынамі. Студэнтамі маглі стаць асобы, якія добра ведалі дзяржаўную мову і маглі пацвердзіць гэта падчас іспыту. У першыя гады незалежнасці Латвійскай Рэспублікі маладыя беларусы не ведалі латышскай мовы на належным узроўні. Менавіта гэты фактар быў асноўнай прычынай адсутнасці беларусаў сярод студэнтаў на першым этапе існавання ВНУ[504]. Выключэннем з'яўляліся студэнты, прынятыя ва ўніверсітэт за асаблівыя заслугі перад дзяржавай – напрыклад, удзельнікі вайны за незалежнасць. Аднак, у гэтай катэгорыі грамадзян беларусы складалі нязначны працэнт. Нам вядомы толькі два такія выпадкі, якія тычыліся Станіслава Красневіча (год паступлення: 1920 г.) і Казіміра Мяжэцкага (1925 г.). Яны былі залічаныя на Сельскагаспадарчы факультэт Латвійскага ўніверсітэта без іспыту па латышскай мове, бо з'яўляліся ваеннымі ветэранамі[505].

З цягам часу колькасць беларусаў, якія добра ведалі дзяржаўную мову, павялічвалася, "моўная" перашкода паступова знікала. Аднак існавала іншая цяжкасць: навучанне ў ВНУ было платным і нятанным. Для беларусаў, адной з найменш заможных нацыянальных груп, гэты фактар з'яўляўся сур'ёзнай перашкодай на шляху да вышэйшай адукацыі. Адна з нешматлікіх студэнтак-беларусак Вераніка Слосман наступным чынам тлумачыла нешматлікасць суайчыннікаў у ВНУ: "*Прычыны таго, што наша моладзь у Латвіі яшчэ да гэтага часу так мала ймкнецца да вышэйшае асветы – досыць важныя і часам апраўдываючыя гэту моладзь, а іменна – што, апрача благога матэрыяльнага становішча беларусоў, паступленне абмяжоўваюць і строгія экзамены. – кожны, жадаючы паступіць у Л.У. павінен здаць экзамен з латышскае мовы вусна і пісьменна, нямецкую мову, і яшчэ адзін – у залежнасці*

---

[502] AAN, MSZ, t. 6194, k. 3.

[503] https://www.archiv.org.lv/studenti/index.php?id=3 (дата доступу: 05.02.2025).

[504] К. Езавітаў, *Стыпэндзіі для беларускае моладзі*, "Голас беларуса" 1926, № 23 ад 20 кастрычніка, с. 3.

[505] LVVA, 7427 f., 1 apr., 2915 l.; LVVA, 7427 f., 1 apr. 1, 9467 l.

ад выбару факультэта. Апрача названых кантрольных, існуюць экзамены конкурсныя, бо лічба жадаючых паступіць ва ўніверсітэт у некалькі разоў перавышае лічбу вольных месцаў. Таму не дзіўна, што цяжка беларусам прэтэндаваць на вытрыманне конкурсу з латышскай мовы з латышамі, калі апрача тэарэтычнае веды звяртаецца ўвага нават на выгавар. Дзеля гэтага наша моладзь і – без патрэбы! – баіцца прабаваць свае сілы"[506].

Нягледзячы на згаданыя цяжкасці, некаторым латвійскім беларусам удалося трапіць у латвійскія ВНУ. Першыя спробы выпускнікоў Даўгаўпілскай і Лудзенскай беларускіх гімназій паступаць ва ўніверсітэты назіраліся ў 1925 г. Тагачасная беларуская прэса інфармавала, што ў тым годзе трое выхаванцаў Лудзенскай беларускай гімназіі паспрабавалі трапіць у ВНУ Латвіі, але правалілася на іспыце па латышскай мове[507]. У 1926 г. у Латвійскую мастацкую акадэмію паступілі тры выхаванцы Даўгаўпілскай беларускай гімназіі: Пятро Мірановіч, Лявон Тамашыцкі і Міхась Калінін[508]. У Латвійскую кансерваторыю паступіла выхаванка тае ж гімназіі Надзея Мікалаева (з 1927 г. – Мікалаева-Комісарс), якая скончыла гэтую ўстанову па класе вакалу ў 1932 г. У Латвійскай кансерваторыі навучаліся таксама беларусы Ярмак і Ганна Бедарава.

Аднак найбольш беларусаў, калі казаць пра вядомыя нам выпадкі, паступала ў Латвійскі ўніверсітэт. У 1927 г. на матэматычна-прыродазнаўчы факультэт паступіў выхаванец Даўгаўпілскай беларускай гімназіі Пятро Журкоўскі. У 1929 г. навучанне на філалагічна-філасофскім факультэце пачаў выпускнік Лудзенскай дзяржаўнай гімназіі Уладзімір Мінчонак. У 1931 г. студэнтам сельскагаспадарчага факультэта стаў Аркадзь Рытаў[509], які скончыў Даўгаўпілскую беларускую гімназію (1924–1928) і Рыжскія беларускія настаўніцкія курсы (1928–1930). У наступным годзе навучанне на матэматычна-прыродазнаўчым факультэце пачаў Раман Віткоўскі, выхаванец Рыжскай гарадской гімназіі[510]. У 1933 г. на эканамічна-юрыдычны факультэт паступілі два чарговыя выпускнікі Даўгаўпілскай беларускай гімназіі – Серафім Дынабургскі[511] і Вераніка Слосман[512]. Паводле нашых падлікаў, да сярэдзіны 1930-х гг. праз Латвійскі ўніверсітэт прайшло не менш як восем латвійскіх беларусаў, палову з якіх складалі выхаванцы Даўгаўпілскай беларускай

---

[506] В.С., *Латвійскі унівэрсытэт і беларускае студэнства*, "Беларуская крыніца" № 5 ад 28 студзеня 1935 г., с. 4.

[507] *Цяжка беларусам папасьць у Латвійскі Унівэрсітэт*, "Голас беларуса" 1925, № 12 ад 8 верасня, с. 4.

[508] *Беларускае жыцьцё у Латвіі*, "Голас беларуса" 1926, № 21 ад 6 кастрычніка, с. 4. Пасля заканчэння акадэміі П. Мірановіч і М. Калінін сталі мастакамі, а Л. Тамашыцкі – скульптарам.

[509] LVVA, 7427 f., 1 apr., 16604 l.

[510] LVVA, 7427 f., 1 apr., 16772 l.

[511] LVVA, 7427 f., 1 apr., 18830 l.

[512] LVVA, 7427 f., 1 apr., 19091 l.

гімназіі. Трое з іх вучыліся на сельскагаспадарчым факультэце, двое – на эканамічна-юрыдычным, двое – на матэматычна-прыродазнаўчым і адзін – на філалагічна-філасофскім[513].

Заслугоўвае ўвагі, што толькі нешматлікім студэнтам-беларусам удалося скончыць навучанне. Аналіз іх асабістых спраў дазваляе меркаваць, што галоўнай прычынай былі матэрыяльныя цяжкасці[514]. Гадавая аплата за навучанне складала 200 латаў. Незаможныя беларусы не заўсёды былі ў стане самастойна пакрыць выдаткі, звязаныя з навучаннем. Некаторыя студэнты падпрацоўвалі ў школах настаўнікамі, але заробку не хапала, каб працягнуць навучанне ў ВНУ. Дапамагаў студэнтам Беларускі школьны аддзел. 29 кастрычніка 1926 г. Рада БША вырашыла звярнуцца ў Культурны фонд Латвіі з просьбай вылучыць для студэнцкай моладзі 5–10 стыпендый, што дазволіла б беларускім юнакам і дзяўчатам не выязджаць за мяжу, па вышэйшую адукацыю. Рада пастанавіла вылучыць сродкі беларускім культурна-асветным таварыствам, каб яны потым прызначылі гэтыя грошы на стыпендыі для студэнцкай моладзі[515].

Сапраўдны пералом у гэтай справе адбыўся 6 сакавіка 1927 г., калі Рада БША ініцыявала стварэнне стыпендыйнага фонду для незаможных беларускіх студэнтаў[516]. Фонд меўся фарміравацца са складак беларускага настаўніцтва, якое, пачынаючы з траўня 1927 г., мусіла адлічваць на гэта па адным лату з заробку. Настаўнікі-беларусы і грамадзяне іншых нацыянальнасцей маглі добраахвотна пералічваць ахвяраванні ў любым памеры. Кіраўніком фонду прызначаўся кіраўнік Беларускага школьнага аддзела, які меў абавязак падчас кожнага пасяджэння Рады БША рабіць справаздачы з дзейнасці фонду. Дапамога студэнтам мела выгляд доўгатэрміновых забяспечаных вэксалямі пазык, якія належала вярнуць на працягу двух гадоў пасля заканчэння ВНУ[517]. У асобных выпадках са сродкаў фонду маглі асігноўвацца грошы на патрэбы беларускай культурна-асветнай працы ў Латвіі. Памер гэтых сум не мог перавышаць 20 латаў[518].

---

[513] Нашы падлікі пацвярджаюцца звесткамі з тагачаснай прэсы, паводле якой у сярэдзіне 1930-х гг. у Латвійскім універсітэце вучылася восем студэнтаў-беларусаў. На жаль, не паведамляліся іх прозвішчы: "*Беларускае студэнцтва пры Л.У. знаходзіцца ў вельмі нязначным ліку: 4 матурысты Дзвінскай дзяржаўнай беларускай гімназіі і столькі-ж – атрымаўшых сярэднюю асвету за мурамі беларускае гімназіі.* В.С., *Латвійскі унівэрсытэт і беларускае студэнства*", "Беларуская крыніца" 1935, № 5 ад 28 студзеня, с. 4.

[514] LVVA, 7427 f., 1 apr., 2915 l.; LVVA, 7427 f., 1 apr. 1, 9467 l.; LVVA, f., 1 ap., 12111 l.; LVVA, 7427 f., 1 ap., 16772 l.; LVVA, 7427 f., 1 ap., 16604 l.

[515] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 34 lp.; LVVA, 2125 f., 5 ap., 10 l., 14 lp.

[516] Н. Пінская, *Сход Рады Беларускага аддзелу,* "Беларуская школа ў Латвіі" 1927, № 5(3), с. 5.

[517] LVVA, 2924 f., 1 apr., 8 l., 2 lp.; LVVA, 2125 f., 5 ap., 77 l., 72 lp.

[518] LVVA, 2924 f., 1 ap., 8 l., 2 lp.

Збор грошай адбываўся не заўжды паспяхова. Частка настаўнікаў неахвотна складалася на карысць фонду. 1 кастрычніка 1927 г. Рада БША прыняла рашэнне аб пільным спагнанні з настаўнікаў аплат у стыпендыйны фонд, бо некаторым студэнтам Латвійскага ўніверсітэта і Латвійскай кансерваторыі пагражала адлічэнне праз запазычанасць[519]. Аднак многія настаўнікі наогул перасталі плаціць гэтую складку, што стала прычынай з'яўлення ў 1933 г. супольнай адозвы Рада Беларускага школьнага аддзела і кіраўніцтва Таварыства беларускіх настаўнікаў у Латвіі. Аўтары заклікалі беларускую грамадскасць актыўней падтрымаць студэнтаў праз ахвяраванні ў стыпендыйны фонд[520]. І ўсё ж фонд не быў у стане дапамагчы ўсім, хто меў патрэбу, нават у памеры мінімальнай стаўкі (20 лат штомесячна). 10 сакавіка 1934 г. кіраўнік БША звярнуўся да настаўніцтва Даўгаўпілскай беларускай гімназіі і пачатковых школ з просьбай урэгуляваць складкі[521].

Нягледзячы на матэрыяльныя цяжкасці, за час існавання фонду (1 траўня 1927 – 1 студзеня 1934 гг.) удалося сабраць 1 933,38 латаў. З гэтай сумы аж 504,38 унеслі педагогі Даўгаўпілскай беларускай гімназіі, 1 429 – настаўнікі астатніх беларускіх школ і БША[522]. Найактыўней унёскі рабілі ў 1928 і 1929 гг., калі настаўнікі гімназіі сплацілі адпаведна – 142,60 і 115,78 латаў, а педагогі пачатковых школ і БША – 338 і 361. Сярод ахвяраванняў прыватных асоб найбольш унеслі: У. Пігулеўскі (80 латаў), С. Сіцько (78), Л. Клагіш (70), К. Езавітаў (68), Я. Камаржынскі (62) і М. Краўчанка (53). З гэтых сродкаў прызначаліся дапамогі для беларусаў – студэнтаў Латвійскага ўніверсітэта, Латвійскай дзяржаўнай кансерваторыі і Латвійскай акадэміі мастацтваў. Грошы выплачваліся ў выглядзе як аднаразовых сум, так і штомесячных стыпендый. Адной з першых дапамогу ў памеры 60 лат атрымала ў 1927 г. студэнтка Латвійскай дзяржаўнай кансерваторыі Надзея Мікалаева. Акрамя таго ў перыяд з 1 траўня 1927 г. да 1 студзеня 1934 г. атрымальнікамі стыпендый былі Валянціна Казлоўская (30 латаў аднаразова), Кацярына Тыран (20 латаў аднаразова), Міхась Калінін (200 латаў), Пятро Мірановіч (810 латаў), Казімір Мяжэцкі (115 латаў), Серафім Дынабургскі (172 латы), Уладзімір Мінчонак (100 латаў), Аркадзь Рытаў (100 латаў), Караль Казакевіч (25 латаў аднаразова)[523]. Адметна, што ў фонд звярталіся таксама латвійскія беларусы, якія вучыліся за мяжой – Валянціна Казлоўская, Язэп Клагіш і Афінаген

[519] LVVA, 2125 f., 5 ap., 77 l., 71 lp.

[520] *Сябром Таварыства Беларускіх вучыцялёў у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 4(21), с. 305; *У Радзе Беларускага Аддзелу пры Міністэрстве Асьветы*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 5(22), с. 329.

[521] LVVA, 2125 f., 5 ap., 405 l., 22 lp.; LVVA, 2067 f., 1 ap., 365 l., 279–280 lpp.

[522] LVVA, 2067 f., 1 ap., 365 l., 279–280 lpp.

[523] *У Радзе Беларускага Аддзелу пры Міністэрстве Асьветы*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 5(22), с. 329; LVVA, 2924 f., 1 apr., 8 l., 1 lp.; LVVA, 2067 f., 1 ap., 365 l., 279–280 lpp.

Зэйгліш[524]. Першая навучалася ў БССР, а два апошнія – у Польшчы і Літве. Усяго са сродкаў стыпендыйнага фонду ў 1927–1933 гг. было выплачана 1 842 латы[525].

Незалежна ад фонду, беларускі актыў ініцыяваў заснаванне індывідуальных стыпендый. 1 красавіка 1928 г. Рады БША (У. Пігулеўскі, К. Езавітаў, С. Маціеўскі і Д. Казлоўскі (ТБНЛ), С. Сахараў ("Прасвета"), М. Дзямідаў ("Беларуская хата"), Я. Шчорс ("Рунь")) прыняла рашэнне стварыць стыпендыю імя Пятра Крачэўскага, каб ушанаваць яго памяць. Стыпендыя была прызначаная для найбольш нацыянальна свядомага беларускага студэнта, які мае найлепшыя поспехі ў навучанні[526]. Адсутнасць крыніц не дазваляе даведацца, які памер мела стыпендыя і хто яе атрымаў.

Як ужо адзначалася, пасля ВНУ стыпендысты мусілі часткамі вярнуць пазыку. Памер штомесячнай выплаты вызначаўся індывідуальна, у залежнасці ад матэрыяльнага становішча асобы. Напрыклад, у траўні 1933 г. Рада БША вызначыла памер У. Мінчонку ў 20 латаў, П. Мірановічу – 15, М. Калініну – 10, К. Мяжэцкаму – 5[527]. Здараліся выпадкі, калі стыпендысты прасілі знізіць памер штомесячнай выплаты. 19 снежня 1933 г. П. Мірановіч прасіў паменшыць з 15 да 10 лат, паколькі ён, працуючы настаўнікам, не атрымліваў сталага заробку. Аднак Рада БША не задаволіла просьбу[528]. Большасць стыпендыстаў вярнула пазыкі. Выключэннем з'яўляўся У. Мінчонак, які не жадаў гэтага рабіць добраахвотна, што змусіла Беларускі школьны аддзел у судовым парадку спагнаць з яго грошы[529].

Падсумоўваючы вынікі дзейнасці фонду, упэўнена можна сцвярджаць, што з яго дапамогай некалькі маладых беларусаў Латвіі змаглі вучыцца

---

[524] 21 верасня 1928 г. Рада Беларускага аддзела адмовілася прызначыць дапамогу для Язэпа Клагіша, студэнта Універсітэта імя Стэфана Баторыя ў Вільні (LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 76 lp.). Аднак пазней яму і Афінагену Зэйглішу (Літоўскі ўніверсітэт у Коўне) удалося атрымаць падтрымку. У 1933 г. першы атрымаў 100 лат, а другі – 30 лат (*У Радзе Беларускага Аддзелу пры Міністэрстве Асьветы*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 5(22), с. 329; LVVA, 2924 f., 1 ap., 8 l., 1 lp.).

[525] Апрача выдаткаў на падтрымку студэнтаў, са сродкаў фонду была прызначана дапамога на "надзвычайныя патрэбы". Згодна з пастановай Рады БША была фінансаваная наступная дзейнасць: 1) экскурсія вучняў беларускіх пачатковых школ Латгаліі ў Рыгу ў 1929 і 1931 гг. (адпаведна 64,20 і 50 латаў); 2) аплата прыезду беларускіх студэнтаў Язэпа Клагіша і Аляксандра Вітушкі – дэлегатаў міжнароднага студэнцкага кангрэса ў Рызе ў 1932 г. (84 латы); 3) частка ганарару паверанаму П. Бергісу ў сувязі са справай ліквідацыі Даўгаўпілскай беларускай гімназіі (55 латаў); 4) пакрыццё судовых выдаткаў у справе спагнання са студэнта А. Мінчонка пазычаных грошай (31,80 латаў). LVVA, 2924 f., 1 ap., 8 l., 1 lp.

[526] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 57 lp.

[527] *У Радзе Беларускага Аддзелу пры Міністэрстве Асьветы*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 5(22), с. 329; LVVA, 2924 f., 1 ap., 8 l., 1 lp.

[528] LVVA, 2125 f., 5 ap., 405 l., 19 lp.

[529] LVVA, 2067 f., 1 ap., 365 l., 280 lp.

ў вышэйшых школах. Дзякуючы гэтаму можна казаць пра прысутнасць беларусаў у ВНУ Латвіі.

Хоць студэнтаў-беларусаў была жменька, яны спрабавалі самаарганізавацца. Арганізацыйная праца была адной з праяў студэнцкай актыўнасці ў той час. У сярэдзіне 1930-х гг. студэнты Латвійскага ўніверсітэта мелі 103 розныя арганізацыі. Некаторыя з іх аб'ядноўвалі ўдзельнікаў паводле нацыянальнай прыкметы. Ва ўніверсітэцкіх мурах дзейнічалі таварыствы студэнтаў – немцаў, рускіх, габрэяў і інш. Беларускія студэнты таксама вырашылі стварыць уласную арганізацыю. У 1933 г. у заходнебеларускай прэсе з'явілася згадка пра тое, што ствараецца Беларускае студэнцкае аб'яднанне ў Латвійскім універсітэце. У склад ініцыятыўнай групы ўвайшлі Пятро Журкоўскі, Казімір Мяжэцкі і Раман Віткоўскі[530]. Увесну 1934 г. быў апрацаваны і перададзены на зацвярджэнне ўніверсітэцкіх улад статут беларускай студэнцкай карпарацыі "Albaruthenica". Аднак арганізацыйная праца рухалася павольна. Для рэгістрацыі студэнцкай арганізацыі трэба было сабраць подпісы 15 студэнтаў. Праз сваю нешматлікасць беларускія студэнты былі вымушаны далучыць да аргкамітэта калег іншых нацыянальнасцей. Напрыканцы першага семестра 1934/35 гг. беларусам адмовілі ў рэгістрацыі, бо сярод сяброў ініцыятыўнай групы была значная колькасць латышоў, а таксама два беларусы, якія належалі да латышскіх студэнцкіх карпарацый[531]. Цікава, што некаторыя беларускія студэнцкія актывісты ў асабістых дакументах беларусамі не запісваліся[532]. Праз немагчымасць стварыць карпарацыю студэнты-беларусы былі вымушаны задаволіцца арганізацыяй гуртка (5 чал.). У адрозненні ад карпарацыі, гурток меў значна менш правоў, але мог весці нацыянальна-культурную працу[533]. У крыніцах захавалася няшмат звестак пра дзейнасць гэтага гуртка. Верагодна, яна не выйшла па-за межы арганізацыйнай фазы. Яго працы не спрыяў час, паколькі актыўнасць студэнтаў-беларусаў супала з пачаткам ліквідацыі аўтаноміі нацменаў у адукацыйнай сферы. Хоць і ў пазнейшыя гады беларусы часам паступалі ў латвійскія ВНУ[534], ва ўмовах новай

---

[530] *Хроніка беларускага жыцьця у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 6(23), с. 354.

[531] Прыкладам быў Пятро Журкоўскі, які з 17 лютага 1930 г. належаў да студэнцкай карпарацыі "Lacuania", якая аб'ядноўвала навучэнцаў з Латгаліі.

[532] У асабістых актах студэнты Пётр Журкоўскі, Раман Віткоўскі і Уладзімір Мінчонак запісаныя латышамі, а Аркадзь Рытаў – рускім. LVVA, f., 1 ap., 12111 l.; LVVA, f., 1 ap., 13923 l.; LVVA, 7427 f., 1 ap., 16772 l.; LVVA, 7427 f., 1 ap., 16604 l.

[533] В.С., *Латвійскі унівэрсытэт і беларускае студэнства*, "Беларуская крыніца" 1935, № 5 ад 28 студзеня, с. 4.

[534] У 1940 г. студэнткай Эканамічна-юрыдычнага факультэта Латвійскага ўніверсітэта стала Зоя Елізарава (Маціеўская), дачка беларускага настаўніка Сымона Маціеўскага. LVVA, 7427 f., 4 ap., 264a l.

грамадска-палітычнай сітуацыі ў краіне яны не праяўлялі нацыянальна-культурнай і арганізацыйнай актыўнасці.

Такім чынам, у разгляданы перыяд у Латвіі дзейнічаў шэраг культурна-асветных таварыстваў беларускай меншасці. Колькасць асоб, якія належалі да іх, падлічыць немагчыма. Не адпавядаюць рэчаіснасці звесткі супрацоўнікаў польскага пасольства ў Рызе, якія сцвярджалі, што ў складзе ўсіх беларускіх культурна-асветных арганізацый у 1934 г. налічвалася толькі 84 чал.[535] Колькасць сяброў такіх таварыстваў, як "Беларуская хата" ці ТБМЛ ішла на сотні. Іншая справа, што колькасць не заўсёды пераходзіла ў якасць працы. З'яўленню арганізацый спрыяла ліберальнае заканадаўства латвійскай дзяржавы. Згодна з ім, грамадскія арганізацыі нацменаў маглі атрымліваць фінансаванне з дзяржаўнага бюджэту на культурна-асветную аўтаномію. Фінансаванне ішло з дзвюх крыніц: са сродкаў Культурнага фонду Латвіі (куды належала звяртацца непасрэдна) і з нацыянальных школьных аддзелаў Міністэрства асветы. У выпадку беларусаў фінансаванне адбывалася праз БША, паколькі магчымасці атрымання сродкаў з Культурнага фонду былі абмежаваныя[536]. На думку У. Пігулеўскага, культурна-асветныя таварыствы павінны былі ўзяць ад настаўніцтва частку цяжару грамадскай працы. З траўня 1930 г. ён прапанаваў выдаткаваць таварыствам больш сродкаў на працу сярод сялянскіх мас: адкрыццё хат-чытальняў, бібліятэк, народных дамоў і г.д. Асаблівая ўвага надавалася грамадскай працы на Лудзеншчыне, дзе беларусы страцілі шэраг школ[537]. Кожная грамадская арганізацыя мусіла ў вызначаны час прадставіць план працы, на якую яна хоча атрымаць грашовую падтрымку, а пасля заканчэння фінансавага года – падрыхтаваць справаздачу. Такая сітуацыя заахвочвала многіх людзей да ўдзелу ў грамадскай культурна-асветнай працы, якая разглядалася як магчымасць дадатковага заробку. Гэтым можна тлумачыць факт, што ў актыве арганізацый ("Беларуская хата", "Рунь", "Асвета", ТБНЛ), якія мелі ідэнтычныя мэты, нярэдка знаходзіліся адны і тыя ж асобы. Яны, у сваю чаргу, набіралі ў арганізацыю людзей, якія лічылі свой удзел у ёй фармальнасцю, таму не выяўлялі актыўнасці[538].

---

[535] AAN, sygn. 477, t. 5328, Raport Poselstwa RP w Rydze, 12 II 1939 r., dot. działalności białoruskiej na Łotwie.

[536] Беларусы не мелі ўласнага прадстаўніка ў Культурным фондзе Латвіі, што, на думку беларускіх дзеячаў, было прычынай адмоў або недастатковага фінансавання беларускіх устаноў. Так, у 1931 г. фонд адмовіўся вылучыць сродкі на выданне зборніка вуснай творчасці латгальскіх беларусаў. *Культурны фонд і беларусы*, "Думка беларуса" 1931, № 2, с. 2.

[537] У чэрвені 1930 г. Рада БША прызначыла на дзейнасць ТБМЛ 1500 латаў, таварыствам "Беларуская хата" і,"Прасвета" – па 750 латаў. LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 19 lp.

[538] Напрыклад, на паседжанні Рады БША 1 кастрычніка 1927 г. кіраўнік таварыства "Рунь" прызнаўся, што за 1,5 года арганізацыя не правяла ніводнага сходу сяброў. Рада ўхваліла

Найбольш ідэйныя дзеячы беларускай меншасці выказвалі незадаволенасць тым, што ў шэрагах беларускіх таварыстваў апынулася нямала выпадковых людзей, абыякавых да беларускай справы, якія далучыліся, разлічваючы на матэрыяльную карысць. Кастусь Езавітаў сцвярджаў, што колькасць сяброў у беларускіх таварыствах не адпавядае якасці іх працы. Ён бачыў патрэбу ачысціць беларускія шэрагі ад непатрэбнага элементу і дзеля гэтага прапаноўваў змяніць падыход да стварэння і дзейнасці культурна-асветных арганізацый. Дзеяч лічыў, што латвійскія беларусы павінны пераасэнсаваць метады дзейнасці. У прыватнасці, ён выступаў супраць "цэнтралізацыі", г.зн. замест стварэння таварыстваў агульнадзяржаўнага характару, якія былі малаэфектыўнымі, К. Езавітаў прапаноўваў ствараць арганізацыі на ўзроўні паветаў і нават валасцей, з мясцовага элементу, які ведае спецыфіку і патрэбы сваёй мясцовасці. На думку беларускага дзеяча, гэта дазволіла б вызваліць ад перагрузкі цэнтральнае кіраўніцтва і перараз мяркаваць нагрузку паміж цэнтрам і мясцовым актывам[539]. На старонках часопіса "Беларуская школа ў Латвіі" ананімны аўтар заклікаў лідараў беларускага руху паклапаціцца пра нацыянальнае аблічча беларускіх арганізацый – пазбаўляцца ад "спекулянтаў" і тых, хто выпадкова далучыўся да руху ды працуе толькі дзеля ўласнага дабрабыту. Аўтар пісаў, што беларуская інтэлігенцыя не павінна спаць, а кожны мусіць укладаць у сваю працу максімум высілку[540].

Належыць падкрэсліць, што ў разгляданы час цэнтр беларускай грамадска-культурнай актыўнасці перасунуўся з Латгаліі ў Рыгу. Польскія дыпламаты тлумачылі гэта тым, што ў сталіцы мацней адчуваліся ўплывы левых партый, якія маглі спрыяць беларусам[541]. Тым часам, К. Езавітаў тлумачыў узрастанне ролі сталічнага актыву пасіўнасцю даўгаўпілскай беларускай інтэлігенцыі[542]. Аднак, на нашу думку, актыўнасці рыжскага беларускага асяродка перадусім спрыяў рост міграцыі беларускага насельніцтва з правінцыі ў сталіцу (гл. раздзел II). Кастусь Езавітаў адзначаў павольны, але паступовы рост нацыянальнай свядомасці рыжанаў-беларусаў, гэтаму спрыяла актыўнасць у горадзе беларускіх арганізацый[543]. Разам з тым, ён

пастанову, згодна з якой кожнае таварыства мусіла як мага часцей ладзіць агульныя сходы сяброў. LVVA, 2125 f., 5 apr., 4 l., 46 lp.

[539] К. Езавітаў, *Хвароба на цэнтрызм і перагрузку*, "Голас беларуса" 1926, № 20 ад 15 верасня, с. 1.

[540] Малады Беларус, *Лыжка дзегцю у бочцы меду*, "Беларуская Школа ў Латвіі" 1926, № 2, с. 10.

[541] AAN, sygn. 477, t. 5328, Raport Poselstwa RP w Rydze, 12 II 1939 r., dot. działalności białoruskiej na Łotwie.

[542] С. Сіцько, *Дзесяцігодзьдзе 1-ае Рыжскае беларускае аснаўное школы, 1923–1933,* Рыга 1934, с. 5.

[543] У гэты час у Рызе месціліся: Беларускі школьны аддзел (*Valdemara iela 36a*), таварыства "Беларуская хата" (*Tumes iela 2*), Таварыства беларускіх настаўнікаў у Латвіі (*Merkela*

пісаў, што беларускія таварыствы ў Рызе не здолелі наблізіцца да беларускіх працоўных мас, таму ўзровень нацыянальнай свядомасці апошніх працягвае быць нізкі[544]. Падагульняючы, дзеяч адзначаў: "*Арганізацыйную і ўсведаміцельную беларускую працу ў Рызе ні ў якім разе няможна яшчэ лічыць закончанай. Цэлыя раёны яшчэ не абслугоўваюцца ні Беларускім тэатрам, ні Т-вам моладзі, ні школамі, ні нашымі культурна-асьветнымі Т-вамі; шмат беларускага жыхарства астаецца дагэтуль яшчэ не звязаным з нашымі арганізацыямі; нічога не зроблена яшчэ ў справе падшукання працы для нашых беспрацоўных і ў справе арганізацыі якога-колечы Бюро працы; няма курсаў для ўздойму кваліфікацыі рабочых; няма і спецыяльных дабрачынных арганізацый. Уся гэта праца не па сілах адной якой-колечы асобе, ці адной якой-колечы арганізацыі, а таму, трэба спадзявацца, праз дзе-які час усе нашы рыжскія беларускія арганізацыі аб'яднаюцца для правядзення і каардынацыі працы ў адно якое-колечы аб'яднанне ці Бюро, каб супольнымі сіламі распачаць працу ў новых кірунках і раёнах*"[545]. З мэтай лепшай арганізацыі беларусаў у горадзе К. Езавітаў раіў: 1) ахапіць усіх беларускіх жыхароў Рыгі культурна-асветнымі арганізацыямі і школамі, 2) стварыць бюро працаўладкавання для беспрацоўных беларусаў, 3) арганізаваць курсы павышэння кваліфікацыі для беларускіх работнікаў[546].

Сталічныя беларусы мелі прадстаўніка ў Рыжскай гарадской школьнай управе, які абіраўся на сходзе рыжскіх беларускіх настаўнікаў. У 1926 г. гэта быў Р. Плыгаўка, у 1927 г. – М. Дзямідаў, у 1928 г. – К. Езавітаў, у 1933 г. – зноў Р. Плыгаўка[547].

Згуртаваныя вакол культурна-асветных таварыстваў дзеячы прадстаўлялі беларускую меншасць у зносінах з латвійскай дзяржавай, бралі ўдзел у агульналатвійскіх падзеях. Напрыклад, 27 жніўня 1925 г. беларуская дэлегацыя (Р. Плыгаўка – ад Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў, М. Дзямідаў – ад таварыства "Беларуская хата" і Я. Шчорс – ад таварыства "Рунь") удзельнічала ў пахаванні былога прэм'ера і міністра замежных спраў З. Мееровіцса. Беларусы ўсклалі вянок, аздоблены латышскімі і беларускімі нацыянальнымі

---

iela 3/5), Беларускае пазыкова-ашчаднае таварыства (*Kalpaka bulvāris 2/8*), Беларускае тэатральнае таварыства (*Dzirnavu iela 65/25*), Таварыства беларускай моладзі ў Латвіі, друкарня беларускага выдавецтва і штомесячніка "Беларуская школа ў Латвіі" (*Vecpilsētā iela 8*).

544 К. Сянкевіч, *Выхадцы беларускае вёскі у Рызе*, "Голас беларуса" 1926, № 4 ад 1 траўня, с. 1.

545 С. Сіцько, *Дзесяцігодзьдзе 1-ае Рыжскае беларускае аснаўное школы*, *1923–1933,* Рыга 1934, с. 6.

546 С. Раўнейка, *Беларуская дыяспара ў Рызе ў пачатку XX ст. (па матэрыялах даследавання К. Езавітава)* [у:] *Айчынная і сусветная гісторыя: сучасныя погляды і метады даследаванняў: Зб. навук. прац: У 2 ч. Ч. 2: Актуальныя пытанні ўсеагульнай гісторыі і гісторыі Беларусі*, Менск 2003, с. 204–207.

547 *Рыская Мястовая Школьная Управа*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1928, № 8(1), с. 132.

колерамі, з надпісам па-беларуску. У беларускай прэсе з'явіліся зацемкі пра трагічна памерлага дзяржаўнага дзеяча, адзначалася, што ён быў шчырым сябрам беларусаў, разумеў іх патрэбы і дапамагаў як у часы існавання БНР, так і пазней[548]. 13 верасня 1929 г. сход прадстаўнікоў беларускіх арганізацый ухваліў прапанову адлічыць па 2% ад заробку работнікаў беларускіх асветных устаноў на набыццё вянка яшчэ аднаму памерламу латвійскаму дзеячу – Я. Райнісу. У выніку ўдалося набыць шыкоўны вянок за 100 латаў[549]. У дзень пахавання – 15 верасня – у Рыгу прыехала дэлегацыя беларусаў з Латгаліі. Пад нацыянальным сцягам беларускія дзеячы прайшлі ў жалобным шэсці ад будынка Сойма да могілак і ўсклалі вянок. Прысутны на ўрачыстасці К. Езавітаў пазней пісаў: "*Мы, беларусы, з асаблівым жалем спаткалі вестку смерці Яна Райніса, бо для нас ён быў не толькі паэтай і вялікім чалавекам, але, апроч усяго гэтага, яшчэ і нязменным прыхільнікам нашага адраджэнчага руху і абаронцам нацыянальна-культурных правоў і патрэб беларускае меншасці ў Латвіі*"[550]. Варта дадаць, што гэта была не адзіны выпадак, калі беларускі актыў Латвіі ўшанаваў памяць Я. Райніса. На 3-я ўгодкі яго смерці К. Езавітаў на старонках часопіса "Беларуская школа ў Латвіі" заклікаў беларускую грамадскасць да ўдзелу ў зборы сродкаў на помнік паэту, настаўнікам было прапанавана ладзіць вечарыны з дакладамі пра паэта, а маладым літаратарам – перакласці на беларускую мову творы нябожчыка[551].

Развіццё беларускага культурна-асветнага руху запавольвалі хворыя амбіцыі некаторых яго ўдзельнікаў. Выезд з Латвіі ў 1925 г. І. Краскоўскага і П. Мядзёлкі-Ірыб не суцішылі эмоцый. Андрэй Якубецкі ў лісце (10 верасня 1926 г.) у рэдакцыю газеты "Голас беларуса" (зацемка называлася *Балота*) заклікаў суайчыннікаў пакінуць прыватныя крыўды і амбіцыі, вярнуцца да шчырай і прадуктыўнай грамадскай працы[552]. Спачатку разгараўся канфлікт

---

[548] *Беларусы згубілі свайго прыхільніка*, "Голас беларуса", 1925, № 10 ад 28 жніўня, с. 1.

[549] LVVA, 2125 f., 5 ap., 195 l., 131 lp.; LVVA, 6845 f., 2 ap., 19 l., 8 lp.

[550] К. Езавітаў, *Беларуская меншасьць у Латвіі ніколі не забудзе Яна Райніса*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 4(14), с. 193.

[551] У адным з артыкулаў К. Езавітаў пісаў: "*Гэтыя пераклады дадуць магчымасць пазнаёміцца з творамі Яна Райніса не толькі той нязначнай частцы беларускае інтэлігенцыі, што жыве зара' ў Латвіі і ведае ўжо латышскую мову, але і ўсяму дванаццаціміллённаму народу беларускаму. Беларускія паэты і літарацкія сілы ў Латвіі, не звяртаючы ўвагі на тыя ўдары, ушчамленне і наскокі на нашы правы і нацыянальна-асветныя ўстановы, што праводзяцца зара' некаторымі латышскімі шавністамі, павінны цвёрда і спакойна працаваць над сапраўдным збліжэннем беларускага і латышскага народа, увесь час маючы на воку і не спушчаючы з думак лепшых сыноў латышскага народа, якія ні ў якой меры ніколі не спачувалі і зара' не спачуваюць апошняму 'моднаму' курсу на прыгнечанне беларускае меншасці*". К. Езавітаў, *Беларуская меншасьць у Латвіі ніколі не забудзе Яна Райніса*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 4(14), с. 194.

[552] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 134, л. 70–71.

паміж У. Пігулеўскім і К. Езавітавым. Абодва мелі прыхільнікаў сярод сяброў беларускіх культурна-асветных таварыстваў. У выніку непаразуменняў у чэрвені 1929 г. К. Езавітаў часова пакінуў управу ТБНЛ. Адначасова ён заклікаў знаёмых дзеячаў БССР не дапамагаць больш матэрыяльна гэтай арганізацыі. У лісце А. Чарвякову (12 чэрвеня 1929 г.) чытаем: "*Не хачу адказваць за тыя крокі, якія можа зрабіць гэта ўгадова-клерыкальная група перад сучасным рэакцыйным урадам. Прашу да часу майго новага паведамлення, гэту групу, калі-б яна звярнулася да Чырвонага Крыжа, ні ў якім выпадку не падтрымліваць, бо гэта будзе ўдарам па групе ўсходняй арыентацыі. Магчыма, што нам, каб ізаляваць гэтую групу, бо яна пакуль што завязана толькі ў Рызе, прыдзецца аддзяліць у самастойныя хаўрусы Дзвінскі і Люцынскі аддзелы нашага таварыства, а таксама стварыць у Рызе новую групу*"[553]. Больш за тое, у асяроддзі лідараў латвійскіх беларусаў наспяваў канфлікт паміж У. Пігулеўскім і М. Дзямідавым. Апошні абвінаваціў свайго апанента ў тым, што ён "выносіць бруд з уласнага гнязда". У адказ У. Пігулеўскі запатрабаваў звольніць М. Дзямідава з пасады настаўніка 2-й Рыжскай беларускай школы. У абарону апошняга выступіла кіраўніцтва таварыства "Беларуская хата". 19 верасня 1930 г. цэнтральная ўправа арганізацыі прызнала патрабаванні У. Пігулеўскага незаконнымі і звярнулася да кіраўніка ТБНЛ С. Сіцько з прапановай абараніць М. Дзямідава як добрага педагога. Бок М. Дзямідава ўзяла таксама Рада 2-й беларускай школы, якая лічыла яго незаменным настаўнікам[554].

Нягледзячы на канфлікты, беларускі актыў разумеў патрэбу супрацоўніцтва на культурна-асветным грунце. Са з'яўленнем беларускіх грамадскіх арганізацый з'явілася патрэба каардынацыі іх дзейнасці. З гэтай мэтай ад сярэдзіны 1920-х гг. склікаліся нарады прадстаўнікоў беларускіх арганізацый. Першая адбылася 19–20 чэрвеня 1926 г. у Рызе. Прычынай была неабходнасць выбраць кандыдата на кіраўніка Беларускага школьнага аддзела. Потым ініцыятыву перахапілі даўгаўпілскія дзеячы. 12 жніўня 1926 г. у Даўгаўпілсе адбылося пасяджэнне прадстаўнікоў даўгаўпілскіх беларускіх арганізацый: Таварыства беларускіх настаўнікаў у Латвіі, таварыства "Прасвета", Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў і таварыства "Беларуская хата": удзельнікі абмяркоўвалі пытанне пра стварэнне каардынацыйнага органу ўсіх даўгаўпілскіх беларускіх арганізацый[555].

Пытанне каардынацыі высілкаў было прадметам увагі ўдзельнікаў з'езда Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў, які адбыўся 26 верасня 1926 г. у Даўгаўпілсе. Выступоўца А. Барткевіч адзначыў, што належыць вітаць

---

[553] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 249 lp.

[554] LVVA, 2750 f., 1 apr., 6 l., 6 lp.

[555] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 93, л. 8.

узнікненне новых беларускіх таварыстваў пры ўмове, што яны будуць стварацца там, дзе раней не было праяў беларускай дзейнасці. Дакладчык, аднак, лічыў непатрэбным і нават шкодным існаванне ў адной мясцовасці некалькіх таварыстваў з падобнымі мэтамі, у склад якіх уваходзяць адны і тыя ж людзі. Ён сцвярджаў, што атмасфера саперніцтва і перацягвання сяброў вядзе да непаразуменняў і сварак. У выніку з'езд ухваліў рэзалюцыю, заклікаўшы да аб'яднання беларускіх культурна-асветных таварыстваў[556]. У працяг гэтай тэмы К. Езавітаў прапанаваў стварыць Беларускі нацыянальны камітэт у Латвіі (БНКЛ), у склад якога павінны былі ўвайсці арганізацыі і таварыствы[557]. Ініцыятыву падтрымаў С. Сахараў, які падкрэсліў, што з дапамогай БНКЛ беларускай меншасці будзе лягчэй абараняць свае інтарэсы. Дзякуючы гэтай арганізацыі, сцвярджаў ён, беларусы змогуць выступаць адзіным фронтам. Дзеяч лічыў, што прадстаўніцтва ў камітэце належыць арганізаваць на парытэтных пачатках. Цэнтральная ўправа Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў мусіла атрымаць права дэлегаваць у склад кіраўніцтва БНКЛ двух прадстаўнікоў, а рэгіянальныя філіялы – па адным. Рада і прэзідыум з 5 сяброў БНКЛ абіраліся б на агульным сходзе. Аднак прапанову стварыць БНКЛ не падтрымалі прадстаўнікі іншых беларускіх арганізацый[558].

У снежні 1927 г. даўгаўпілскія беларускія арганізацыі стварылі Раду праўлення даўгаўпілскіх беларускіх арганізацый (старшыня С. Сахараў, сакратар І. Фёдараў). Новы орган складаўся з 7 асоб, які прадстаўлялі розныя арганізацыі. Першы яго склад быў наступны: С. Сахараў (ТБНЛ), П. Жэрдзі (таварыства "Прасвета"), А. Райко (таварыства "Беларуская хата"), А. Сальцэвіч (БТТЛ), кс. Я. Гайлевіч (таварыства "Араты"), Я. Кастылюк (БЦПАТ), У. Раткін (Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў). Удзельнікі падзялілі абавязкі і працу. Напрыклад, таварыства "Прасвета" занялося стварэннем калоніі для дзяцей з незаможных сем'яў, а арганізацыю дзіцячага прытулку ўзяло на сябе ТБНЛ[559]. 29 красавіка 1928 г. і 8 ліпеня 1928 г. у Даўгаўпілсе адбыліся другая і трэцяя канферэнцыі (нарады) прадстаўнікоў беларускіх арганізацый – была патрэба абмеркаваць стаўленне да выбараў у Сойм. Чацвёртая нарада была скліканая 26 і 30 сакавіка 1929 г. у Даўгаўпілсе. У ёй узялі ўдзел 17 дэлегатаў з правам вырашальнага голасу і 10 – з правам дарадчага[560].

---

[556] *2-гі Зьезд дэлегатаў "Т-ва беларуса-выбаршчыкаў у Латвіі". Аб патрэбе аб'еданьня беларускіх асьветных арганізацый, якія маюць аднолькавыя мэты і працуюць у адным мейсцу*, "Голас беларуса" 1926, № 23 ад 20 кастрычніка, с. 1–2.

[557] LVVA, 3009 f., 1 apr., 3 l., 107 lp.

[558] LVVA, 3009 f., 1 apr., 31 l., Пратакол II схода дэлегатаў Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў у Дзяржаўны Сойм, гарадскія, павятовыя і валасныя самаўрады ў Латвіі, 26 IX 1926.

[559] *У аб'яднаньні моц*, "Школьная праца" 1928, № 10, с. 23.

[560] *З беларускага жыцьця у Латвіі*, "Голас беларуса" 1929, № 2 ад 22 ліпеня, с. 4.

Удзельнікі канферэнцыі, якая прайшла ўлетку 1929 г., прынялі рашэнне аб стварэнні Беларускай нацыянальнай рады ў Латвіі (БНРЛ)[561]. Праект статута новага органа быў разасланы кіраўніцтву беларускіх арганізацый. Каб яго абмеркаваць, на 18 жніўня 1929 г. у Даўгаўпілсе было вырашана склікаць беларускую канферэнцыю[562]. Паводле праекту статута, мэтай арганізацыі было: 1) аб'яднанне ўсіх беларускіх культурна-асветных, палітычных і іншых таварыстваў; 2) падняццё нацыянальнай свядомасці беларускай меншасці; 3) абарона культурных, эканамічных і палітычных правоў і інтарэсаў беларускага насельніцтва ў Латвіі. Дзеля дасягнення гэтых мэт БНРЛ меркавала склікаць канферэнцыі і кангрэсы, ладзіць культурныя і асветныя мерапрыемствы, адкрываць дамы культуры, бібліятэкі, чытальні, выдаваць перыёдыкі і г.д. Сваёй дзейнасцю арганізацыя павінна была ахапіць усю Латвію, а сядзібай абвяшчаўся Даўгаўпілс[563].

Адной з праяў супольнай дзейнасці сталі Дні беларускай культуры, упершыню зладжаныя ў 1929 г. з ініцыятывы Рады беларускіх арганізацый. Спецыяльна створаны камітэт заклікаў беларускую грамадскасць падтрымаць мерапрыемства грашыма. Больш за тое, было вырашана, што з траўня па ліпень 1929 г. кожны настаўнік адлічыць на патрэбы арганізацыі свята па 2% ад месячнага заробку[564]. Планавалася, што пры кожнай беларускай школе адбудуцца публічныя лекцыі, чытанні вершаў і прозы, канцэрты, выступы хораў і тэатральныя пастаноўкі. 29–30 сакавіка 1929 г. удзельнікі канферэнцыі беларускіх арганізацый Даўгаўпілшчыны вырашылі, што Дні беларускай культуры пройдуць у траўні і чэрвені ў Латгаліі. У праграме былі вучнёўскія выставы, куток беларускага друку, канцэрты. Мэтай мерапрыемства было азнаямленне беларускіх мас і прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей з развіццём беларускай культуры за апошнія тры дзесяцігоддзі. Цэнтральныя мерапрыемствы меліся адбыцца ў Даўгаўпілскай беларускай гімназіі[565]. Урачыстасці прайшлі таксама ў Лудзы. 20 ліпеня 1929 г. у мурах тамтэйшай беларускай школы адбылася вечарына, у якой узялі ўдзел У. Пігулеўскі (зрабіў даклад пра становішча нацыянальных меншасцей у Еўропе), С. Казека, М. Дзямідаў і К. Езавітаў (прачытаў даклад пра беларускае адраджэнне). Вучні школы зладзілі выставу беларускіх выданняў.

---

561 *Хроніка*, "Пагоня" 1930. № 1, с. 12.

562 *З беларускага жыцьця у Латвіі*, "Голас беларуса" 1929, № 2 ад 22 ліпеня, с. 4.

563 LVVA, 2067 f., 1 ap., 364 l., 511–512 lpp.

564 *Ад Дзьвінскага Комітэту па ладжаньню "Дня Беларускае Культуры"*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1929, № 9(1), с. 4–5.

565 *День белорусской культуры*, "Латгальская мысль" 1929, № 19 от 23 мая, с. 3; *Беларусы, арганізуйце і правадзіце па ўсіх вёсках "Дзень Беларускае Культуры"*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1929, № 9(1), с. 2.

Потым драматычны гурток пад кіраўніцтвам М. Грыўскага паказаў п'есы Цішкі Гартнага *Лекары і лекі* і Франціішка Аляхновіча *Пан міністр*[566].

Са справаздачы камітэта па арганізацыі Дзён беларускай культуры вынікае, што з траўня па лістапад 1929 г. у Даўгаўпілскім павеце – прайшло 11 святочных мерапрыемстваў, у Лудзенскім – 9, у Ілукштанскім – 2. У кожным брала ўдзел ад 100 да 500 чал. Падчас сустрэч і вечарын да прысутных прамаўлялі беларускія дзеячы (М. Дзямідаў, С. Пігулеўскі, С. Сахараў, К. Езавітаў і інш.), таксама ставіліся спектаклі (*Птушка шчасця*, *Дзядзька Якуб*, *Жаніх з Піцера*, *Лекары і лекі*, *Чорт і баба*, *Птушка на волі*, *На Антокалі*), ладзіліся паказы кіно. Найбуйнейшае мерапрыемства (500 чал.) адбылося ў вёсцы Залессе Лудзенскага павета. У ім узялі ўдзел М, Дзямідаў, Я. Кастылюк і Я. Зэйгліш, а таксама выступіў хор пад кіраўніцтвам М. Іванова[567].

Значнай падзеяй у справе кансалідацыі беларускіх культурна-асветных арганізацый быў з'езд прадстаўнікоў беларускай нацыянальнай меншасці ў Латвіі, скліканы Радай праўлення беларускіх арганізацый Даўгаўпілса 26 студзеня 1930 г. У яго прэзідыуме засядалі: У. Пігулеўскі – ганаровы старшыня, С. Сахараў – старшыня, К. Езавітаў і Д. Мяжэцкі – намеснікі старшыні, С. Лук'янскі, М. Дзямідаў і С. Фёдараў – сакратары. У працы з'езду ўзялі ўдзел 172 дэлегаты, у тым ліку – кіраўнік БША, інспектар беларускіх пачатковых школ, настаўнікі беларускіх гімназій і школ, аграномы з беларускіх мясцовасцей, прадстаўнікі беларускіх арганізацый (па 2 асобы – ад цэнтральнага праўлення кожнага культурна-асветнага таварыства, па 1 – ад кожнага рэгіянальнага праўлення, па 1 – ад 10 сяброў кожнага рэгіянальнага аддзела), сябры школьных рад, прадстаўнікі парафій і органаў самакіравання[568]. Удзельнікі з'езду выслалі прывітальныя тэлеграмы міністру-

---

[566] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 210–212 lpp.

[567] *Справаздача Камітэту па ладжаньню "Дзень Белр. Культуры"*, "Наша доля" 1930. № 2 ад 7 лютага, с. 4; *Дзень беларускай культуры ў Люцыну*, "Голас беларуса" 1929, № 2 ад 22 ліпеня, с. 3.

[568] Парадак працы з'езда быў наступны: даклад У. Пігулеўскага *Становішча беларускай нацыянальнай меншасці ў Латвіі*, Я. Кастылюка *Культурна-асветнае становішча беларусаў у Латвіі*, К. Езавітава *Агульналатвійская перапісь 11 лютага 1930 г. у Латвіі і яе значэнне для беларусаў*; даклады прадстаўнікоў таварыстваў: "Беларуская хата" (старшыня М. Дзямідаў), "Рунь" (сябра праўлення Н. Пінская), "Прасвета" (старшыня П. Жэрдзі), ТБНЛ (старшыня С. Сіцько і сакратар Я. Камаржынскі), Таварыства беларускага тэатру ў Латвіі (Уладзіслаў Якубоўскі, С. Ратко – старшыня даўгаўпілскага аддзела, сябра праўлення – М. Краўчанка), беларускага прасветнага кааператыва "Культура і праца" (старшыня У. Пігулеўскі), Беларускага выдавецтва ў Латвіі (старшыня К. Езавітаў), Таварыства беларускай моладзі ў Латвіі, Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў (К. Езавітаў), Беларускага сельскагаспадарчага таварыства "Араты" (П. Жэрдзі і У. Раткін). LVVA, 2750 f., 1 ap., 7 l., 44 lpp.; LVVA, 1826 f., 1 ap., 1004 l., 70 lp.; НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 98, л. 5.

-прэзідэнту Латвіі, прэм'ер-міністру і міністру асветы, выказаўшы ўдзячнасць за стварэнне ў краіне добрых умоў для нацыянальна-культурнага развіцця беларускай меншасці. На пачатку мерапрыемства ўдзельнікі праспявалі гімны – латвійскі дзяржаўны і беларускі *Не пагаснуць зоркі ў небе*. Галоўнай тэмай з'езду было абмеркаванне стану беларускай нацыянальнай працы. Адзін з выступоўцаў, Віктар Вальтар, адзначыў, што нягледзячы на рост нацыянальнай самасвядомасці латвійскіх беларусаў народныя масы па-ранейшаму застаюцца досыць пасіўнымі і абыякавымі да нацыянальнай працы[569]. Школьны інспектар Я. Кастылюк звяртаў увагу на перашкоды ў школьнай працы, сярод якіх галоўнымі былі: 1) наступствы беларускага працэсу; 2) адсутнасць свядомага нацыянальнага настаўніцтва; 3) прысутнасць у школах настаўнікаў-небеларусаў; 4) варожасць да беларускай справы з боку рускіх і польскіх дзеячаў. Выступоўца казаў пра нястачу кніг і падручнікаў, а таксама адпаведных памяшканняў у школьных будынках. Выйсце са складанай сітуацыі ён бачыў у: 1) пераносе арганізацыйнай справы з гораду ў вёску; 2) заснаванні бібліятэк-чытальняў; 3) арганізацыі курсаў і школ для дарослых; 4) стварэнні вандроўнага беларускага тэатра; 5) наладжанні працы настаўніцкіх курсаў такім чынам, каб яны рыхтавалі не толькі педагогаў, але і грамадскіх дзеячаў[570].

На прапанову У. Пігулеўскага ўдзельнікі канферэнцыя прынялі рэзалюцыю пра тое, што: 1) беларуская меншасць у Латвіі, звязаная з латвійскім народам не толькі агульнай бацькаўшчынай, але і адзінствам гістарычных і духовых імкненняў, лічыла і лічыць латвійскі народ сваім сапраўдным і шчырым братам, 2) беларуская меншасць у Латвіі, побач з прадстаўнікамі іншых народаў, карыстаецца ўсімі правамі, якія прадугледжвае заканадаўства, 3) беларуская меншасць заўсёды лічыла і лічыць сябе арганічнай часткай латвійскай дзяржавы і сумленна выконвае свае грамадзянскія абавязкі[571]. Акрамя таго, была прынята рэзалюцыя паводле даклада школьнага інспектара Я. Кастылюка, у якой адзначалася, што належыць: 1) перанесці арганізацыйную працу ў вёскі; 2) разгарнуць шырокую пазашкольную асвету (адчыніць вячэрнія курсы, хаты-чытальні, праводзіць лекцыі); 3) наладзіць працу беларускага вандроўнага тэатра і хораў; 4) прасіць Беларускі школьны аддзел адчыніць у 1930 г. для настаўнікаў і нацыянальна арыентаванай моладзі курсы па беларусазнаўстве і грамадскай працы; 5) звярнуць увагу БША на падрыхтоўку маладых настаўніцкіх кадраў; 6) наладзіць культурна-асветную працу на Ілукшчыне і Рэжыччыне; 7) стварыць пры беларускіх настаўніцкіх курсах, а таксама пры школах і гімназіях,

[569] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 100, л. 6.

[570] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 100, л. 8.

[571] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 100, л. 7–8, 18.

краязнаўчыя гурткі па зборы вуснай народнай творчасці; 8) прасіць БША звярнуцца ў Культурны фонд Латвіі з просьбай вылучыць 1 тыс. латаў на друк зборніка беларускага фальклору, а таксама на далейшую працу па зборы этнаграфічнага матэрыялу[572]. Належыць адзначыць, што з'езд прыцягнуў да сябе ўвагу мясцовай рускамоўнай прэсы[573].

Істотнай падзеяй у жыцці беларускіх культурна-асветных таварыстваў быў чарговы перапіс насельніцтва, якія адбыўся ў лютым 1930 г. Беларускі актыў загадзя рыхтаваўся да гэтай падзеі. К. Езавітаў лічыў, што выніку перапісу будуць мець для беларусаў наступствы як статыстычныя, так і маральныя. Бо, па-першае, ад колькасці беларусаў у Латвіі залежыць памер сродкаў, вылучаных дзяржавай на нацыянальна-культурную і асветную справу. Па-другое, вынікі перапісу паўплываюць на тое, як на беларусаў будуць глядзець іншыя. К. Езавітаў звяртаў увагу на заганы ў працы Статыстычнага ўпраўлення, якое падчас вызначэння нацыянальнасці кіруецца рэлігійнай прыкметай[574]. Беларускія дзеячы асцерагаліся, што маласвядомыя латгальскія беларусы паддадуцца агітацыі "польскіх і рускіх нацыяналістаў" і запішуцца: каталікі – палякамі, а праваслаўныя – рускімі[575]. У сувязі з гэтым Рада праўлення даўгаўпілскіх беларускіх арганізацый 7 студзеня 1930 г. вырашыла, каб кожны сябра органа абышоў знаёмых беларусаў і правёў тлумачальную размову. Акрамя таго, было вырашана, што беларускія настаўнікі маюць рэгістравацца перапісчыкамі. Напярэдадні ж перапісу меркавалася склікаць у Даўгаўпілсе сходы ў беларускай гімназіі і пачатковай школе[576]. У газеце "Наша доля" з'явілася адозва беларускіх арганізацый (ТБНЛ, таварыства "Рунь", таварыства "Беларуская хата" і інш.) з заклікам да людзей запісвацца беларусамі. У адозве чытаем: "*Кожны беларус на пытанне перапісчыка 11 лютага: 'хто ты па нацыянальнасці' павінен цвёрда і смела адказаць: 'я беларус' (па латышску 'baltkrievs') і паглядзець, каб цябе так і запісалі. Ніхто не павінен з беларусаў выракацца сваей нацыянальнасці! Памятайце, што чалавек, што выракаецца і саромеецца сваёй беларускай нацыянальнасці, ёсць здраднік свайго народа! Не мяшай толькі нацыянальнасць і рэлігію. Ад таго, што ты ходзіш маліцца Богу ў царкву, ты не ёсць 'русскій', ад таго, што ходзіш у касцёл, ты не ёсць 'паляк'. Ці ты каталік, ці ты праваслаўны, ці нават стараабрадзец, але па нацыянальнасці ты ёсць беларус і такім павінен запісацца. Не слухай, беларусе, калі табе будзе*

---

572 НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 100, л. 22; LVVA, 1826 f., 1 ap., 1004 l., 68 lp.

573 *Белорусская конференция в Двинске (От двинского кореспондента "Сегодня")*, "Сегодня" 1930, № 30 ад 29 января, с. 4.

574 НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 100, л. 11.

575 LCVA, f. 368, ap. 1, b. 33, l. 278.

576 НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 100, л. 1зв.

хто-небудзь напяваць салодкія песні аб тым, каб ты адрокся бы ад сваёй нацыі і назваў бы сябе ці 'русскім', ці 'поляком', ці яшчэ кім-небудзь. Ты радзіўся беларусам! Твае дзяды і прадзеды былі беларусамі! Ты гутарыш па беларуску! Ты спяваеш беларускую песню! Таму ты павінен запісвацца беларусам усюды, дзе бы ты ні быў і хто бы цябе ні запытаў"[577]. Вынікі перапісу былі прадметам аналізу ўдзельнікаў пасяджэння Рады праўлення беларускіх арганізацый Даўгаўпілса 9 ліпеня 1930 г.[578]

Чарговым важным этапам для культурна-асветнага руху стала святкаванне 10-х угодкаў беларускай нацыянальнай працы ў Латвіі. 15 снежня 1930 г. Рада праўлення беларускіх арганізацый Даўгаўпілса прапанавала ў траўні 1931 г. у Рызе, Даўгаўпілсе і Лудзы, а таксама па магчымасці ў латгальскіх вёсках, склікаць урачыстыя сходы са спектаклямі і канцэртамі; заклікаць усе беларускія арганізацыі, установы і школы пачаць падрыхтоўку да святкавання; стварыць фонд дзеля збору добраахвотных складак на арганізацыю ўрачыстасцей; выдаць беларускі альманах "Беларусы ў Латвіі" ў 2 частках (гісторыя за 10 гадоў і літаратурная частка разам з вуснай народнай творчасцю Латгаліі); прасіць БША звярнуцца ў Культурны фонд Латвіі з просьбай выдаткаваць 800 латаў на выданне альманаха, вылучыць сумы (да 500 латаў) на ўдзел у святкаванні настаўнікаў і вучняў вясковых школ[579]. Ініцыятыву святкавання падтрымаў шэраг культурна-асветных таварыстваў[580]. Кіраўніцтва Беларускага школьнага аддзела пастанавіла 29 снежня 1930 г. скончыць заняткі ва ўсіх школах пасля трэцяй лекцыі, каб потым змаглі адбыцца ўрачыстасці ў гонар юбілею[581]. Аднак галоўныя святкаванні адбыліся ў 1931 годзе. У некаторых мясцовасцях прайшлі сходы беларускай грамадскасці, падчас якіх чыталіся лекцыі і ладзіліся выступы хораў. Захаваліся звесткі пра мерапрыемствы ў Даўгаўпілсе. 10 траўня 1931 г. у будынку беларускай пачатковай школы з лекцыямі выступілі С. Сахараў (*Агульнае становішча беларускай нацыянальнай меншасці ў Латвіі*) і А. Барткевіч (*Гістарычны шлях беларускага народа*). Наступны сход адбыўся 17 траўня ў Даўгаўпілскай беларускай гімназіі, падчас якога даклады зрабілі С. Сахараў і У. Пігулеўскі. Апошні, трэці сход быў скліканы 7 чэрвеня – у беларускім дзіцячым садку на Старым Фарштаце[582].

Вынікі працы беларускіх культурна-асветных арганізацый складана ацаніць адназначна. Нават самі беларускія дзеячы прызнавалі, што ў некаторых

---

[577] *Адозва да беларусаў Латвіі*, "Наша доля" 1930. № 2 ад 7 лютага, с. 1.

[578] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 93, л. 10.

[579] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 93, л. 14; LVVA, 1826 f., 1 ap., 1004 l., 53 lp.

[580] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 94, л. 6.

[581] LVVA, 2125 f., 5 ap., 87 l., 80 lp.

[582] *У 10 годзьзю беларускае працы ў Латвіі*, "Думка беларуса" 1931, № 1, с. 3.

кутках Латгаліі яе плён быў малаадчувальны. Адзін з карэспандэнтаў часопіса "Беларуская школа ў Латвіі" пісаў: "*У Пакумінскім обчаствe, Звіргздзецкай воласці, Люцынскага павета жыве значная лічба беларусаў. Нацыянальнай свядомасці тутака мала. Школы беларускай няма. Да таго-ж вучыцялі мяшаных школ у Пакуміне і Эдвардаславе ды расейскай школы ў Шкінцаве робяць усё, каб яшчэ больш прытупіць нацыянальную свядомасць беларускага сялянства. Яны гатовы зрабіць беларусаў 'рускімі-католікамі' і латгальцамі, а нават і палякамі, толькі б не лічылі сябе беларусамі. Некалькі разоў тутака ўдалося наладзіць у памяшканні Пакумінскай мяшанай школы беларускія спектаклі, але ўладу маючым гэта не спадабалася, і вось ужо некалькі гадоў немагчыма наладзіць у Пакуміне беларускай вечарыны, бо школа не згаджаецца даць для гэтага сваё памяшканне. Ёсць у Пакуміншчыне і жменька маладой беларускай інтэлігенцыі, якая выйшла з Дзвінскай беларускай гімназіі, але яна, на жаль, мала актыўная і грамадскае ініцыятывы нямаль зусім не выяўляе*"[583].

Разам з тым, бясспрэчным плёнам беларускай культурна-асветнай працы ў 1925–1934 гг. было далучэнне да нацыянальнай актыўнасці прадстаўнікоў маладога пакалення латвійскіх беларусаў. Выхаванцы беларускіх школ і гімназій, у адрозненне ад сваіх бацькоў, сустракалі паўналецце нацыянальна свядомымі людзьмі.

Прэса і кнігавыданне

Перыядычныя выданні

Падчас нацыянальнага адраджэння перыядычны друк разглядаўся як адзін з галоўных сродкаў нацыянальна-культурнай агітацыі. Яго ролю ў фарміраванні нацыянальнай ідэнтычнасці жыхароў Цэнтральна-Ўсходняй Еўропы складана пераацаніць. Таму менавіта з выдання перыёдыкаў пачыналі культурна-асветную працу многія мясцовыя адраджэнцы. З дапамогай друкаванага слова яны намагаліся ўсталяваць сувязь з масамі, каб пашыраць сярод іх нацыянальную прапаганду[584]. Па меры павелічэння колькасці пісьменных людзей, прэса ператваралася ў адзіную крыніцу масавай інфармацыі, якая ўплывала на грамадскую думку. З дапамогай перыёдыкі адраджэнцы маглі шукаць патэнцыйных прыхільнікаў і фарміраваць іх погляды. Беларускі

[583] Малады Пакумінец, *Да справы зьбіраньня беларускіх народных твораў*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 6(23), с. 340.

[584] M. Hroch, *Małe narody Europy. Perspektywa historyczna*, Wrocław; Warszawa; Kraków 2003, s. 148.

актыў Латвіі гэта добра разумеў, аднак праз матэрыяльныя цяжкасці працяглы час мясцовыя беларусы былі пазбаўлены ўласнага друкаванага органа. Першыя беларускія выданні ў Латвіі ў міжваенны час, якія прэтэндавалі на перыядычнасць, мелі абмежаваны і лакальны характар. Пытанне пра выданне перыёдыка было ўзнята яшчэ ўдзельнікамі першай беларускай настаўніцкай канферэнцыі (28–30 снежня 1922 г., Даўгаўпілс). Аднак праз нястачу сродкаў ад задумы было вырашана адмовіцца[585].

Першыя спробы выдання перыёдыкаў рабіла вучнёўская моладзь пад апекай настаўнікаў. З ініцыятывы К. Езавітава ў 1923–1924 гг. у Лудзенскай беларускай гімназіі выходзіў вучнёўскі часопіс **"Ластаўка. Вучнёўская часопісь Люцынскае Беларускае Гімназіі".** У мастацкім афармленні перыёдыка браў удзел Лявон Тамашыцкі, які пазней паступіў у Латвійскую акадэмію мастацтваў. Захаваліся сціплыя звесткі пра выданне. Можна меркаваць, што выйшла не менш чатырох нумароў 30-старонкавага часопіса. У выданні можна было знайсці літаратурныя творы, фальклор, вучнёўскую хроніку. Выдаўцом лічылася "Выдавецкая секцыя вучнёўскага гуртка Люцынскае Беларускае гімназіі"[586]. Тэхнічная якасць часопіса была не найлепшая, бо ён выходзіў у рукапісным выглядзе, а пасля асобнікі капіраваліся з дапамогай шапірографа. Перыёдык меў невялікі наклад. Напрыклад, № 4 за 1923 г. быў выдадзены колькасцю толькі 45 асобнікаў[587]. Існуюць звесткі, што ў той самы час у беларускай пачатковай школе ў Даўгаўпілсе выдаваўся рукапісны штомесячнік "**Пачатковец"**[588]. Гурток беларускай моладзі Даўгаўпілса падрыхтаваў рукапісны часопіс **"Моладзь"**. Даследчыкам вядомы толькі адзін нумар перыёдыка, датаваны сакавіком 1925 г.[589]

Да з'яўлення беларускай прэсы ў агульнадзяржаўным маштабе спрычыніўся К. Езавітаў. Пасля заканчэння беларускага працэсу ён заснаваў

---

[585] А. Чарняўскі, *Выдавецкая дзейнасць беларускай нацыянальнай меншасці ў міжваеннай Латвіі (1918–1940 гг.)*, "Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Серыя 1. Гісторыя і археалогія. Філасофія. Паліталогія" 2023, т. 15, № 3, с. 59.

[586] M. Jankowiak, *Prasa białoruska międzywojennej Łotwy (przegląd wydawnictw),* "Studia Białorutenistyce" 2021, t. 15, s. 17.

[587] А. Чарняўскі, *Выдавецкая дзейнасць беларускай нацыянальнай меншасці ў міжваеннай Латвіі (1918–1940 гг.)*, "Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Серыя 1. Гісторыя і археалогія. Філасофія. Паліталогія" 2023, т. 15, № 3, с. 59.

[588] М. Ліс, *Культурна-асветніцкая і фальклярыстычная дзейнасць С.П. Сахарава ў кантэксце нацыянальна-культурнага адраджэння беларусаў Латвіі* [у:] *Фальклярыстычныя даследаванні. Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі. Зборнік артыкулаў*, рэд. Р. Кавалёва, Менск 2005, с. 22.

[589] Д. Крэнт, *Матэрыялы Цэнтра даследаванняў старадрукаваных кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі як крыніца па гісторыі беларускага нацыянальна-культурнага жыцця ў Латвіі ў 1920–1930-ыя гг.*, "Латыши и белорусы: вместе сквозь века", Минск 2023, № 12, с. 120.

першую ў міжваеннай Латвіі беларускую газету. 27 красавіка 1925 г. К. Езавітаў пісаў В. Ластоўскаму: "*Хачу наладзіць – і ўжо пачаў – грамадскую працу, ды бракуе грошай. Як выйду са становішча – яшчэ не ведаю. Да зарэзу патрэбна свая газета. Раблю ўсе высілкі. Мо што і ўдасцца наскрэсці. Надзей мала. Але – трэба-ж!*"[590]. Перыёдык меў назву **"Голас беларуса"**, галоўным рэдактарам і выдаўцам яго стаў К. Езавітаў. Першы нумар пабачыў свет 10 чэрвеня 1925 г. Рэдакцыя знаходзілася ў Рызе, па адрасе *Mārstaļu iela 19*, дзе ў буднія дні дзяжурылі супрацоўнікі рэдакцыі. Акрамя галоўнага рэдактара з выданнем у розны час былі звязаныя Ніна Пінская, Пятро Журкоўскі, Алесь Сальцэвіч. Апошні ў ліпені 1925 г. быў прызначаны адміністратарам газеты[591]. Экспедытарам выдання была Марыя Вайноўская[592]. Спачатку газета выходзіла 1-га, 10-га і 20-га дня кожнага месяца, але з цягам часу была ператворана ў двухтыднёвік. Аднак у рэчаіснасці "Голас беларуса" выходзіў нерэгулярна. Тэхнічны ўзровень выдання быў даволі высокі. Газета мела чтыры старонкі. Першую старонку аздабляла выява ўзыходзячага сонца. Ад № 12 за 1925 г. рэдактар друкаваў у выключных выпадках матэрыялы на рускай мове, каб "*даць магчымасць выказаць свае думкі і тым чытачам 'Голасу беларуса', што скончылі расейскія школы і пішуць па-расейску*"[593].

Паводле галоўнага рэдактара, выхад "Голасу беларуса" меў пачаць новы этап у жыцці беларускай меншасці ў Латвіі, а менавіта надаць нацыянальнаму руху больш арганізаваны характар. Мэты газеты акрэсліваліся наступным чынам: "*Нацыянальнае ўсведамленне беларускае меншасці ў Латвіі; згуртаванне яе на сацыяльна-эканамічным і нацыянальным грунце; абарона інтарэсаў беларускага сялянства, працаўнікоў і працоўнае інтэлігенцыі; абарона беларускае культуры і нацыянальнае самабытнасці*"[594]. На старонках перыёдыка публікаваліся лісты і нават вершы чытачоў. У газеце былі рубрыкі, прысвечаныя палітыцы і гаспадарцы, міжнародным справам (*Са ўсяго свету*, *Што чуваць на Свеце*), сітуацыі беларускай меншасці ў Латвіі (*Беларускае жыццё*, *Латышы аб беларусах*), пытанням асветы (*Аб нашай школе*), друкаваліся лісты чытачоў, рэклама (у тым ліку кніжных набыткаў), прысутнічаў літаратуры куток[595].

Аўтарам большасці палемічных і аналітычных артыкулаў выступаў К. Езавітаў, друкаваліся таксама зацемкі і матэрыялы іншых беларускіх

---

[590] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1585.

[591] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 135, л. 5.

[592] LVVA, 3235 f., 2 apr., 4635 l., 139 lp.

[593] Цыт. пав.: Ю. Габранава, *"Голас беларуса" – газета беларускай дыяспары ў Латвіі пачатку XX стагоддзя*, "Беларуская лінгвістыка" 2015, т. 75, с. 87.

[594] *1921–1925,* "Голас беларуса" 1925, № 1, с. 1.

[595] Ю. Габранава, *"Голас беларуса" – газета беларускай дыяспары ў Латвіі пачатку XX стагоддзя*, "Беларуская лінгвістыка" 2015, т. 75, с. 85–86.

дзеячаў з Латвіі і замежжа – С. Сахарава, В. Ластоўскага і інш. Выданне асвятляла розныя бакі беларускага жыцця ў Латвіі ў галіне палітыкі, культуры, адукацыі. Значная ўвага надавалася асвеце беларускага насельніцтва, захаванню мовы і культуры, умацаванню нацыянальнай самасвядомасці. Газета рэагавала на галоўныя грамадска-палітычныя і культурныя падзеі і змены ў краіне, якія тычыліся беларускай меншасці. Напрыклад, на асіміляцыйныя тэндэнцыі палітыкі латвійскай дзяржавы ў дачыненні да нацменаў. Тут аўтары і выдаўцы газеты не маглі абмінуць увагай пытанне захавання беларускай ідэнтычнасці ў Латвіі. Газета заклікала спыніць латышызацыю, русіфікацыю і паланізацыю беларусаў (*Ратуйце беларускую моладзь аб аблатышываньня, абмаскаліваньня і абпалячываньня* (1925, № 15)). Аўтары заклікалі беларусаў трымацца разам, не здраджваць сваёй нацыянальнасці (1926, № 31, 32), аддаваць дзетак у родныя школы (1929, № 61). Выданне агітавала беларусаў шанаваць уласную мову і культуру. У адным з артыкулаў адзначалася, што калі самі беларусы не будуць з павагай ставіцца да ўласнай мовы, іх не будуць паважаць чужыя: "*Только уважение к самому себе, к своей деревенской жизни, к своему труду и своему народному языку, даст белорусскому крестьянину сознание своей правоты и силы, и даст ему твердую силу к борьбе за лучшее будущее*"[596].

Невыпадкова, на старонках газеты можна знайсці шмат інфармацыі пра беларускую асветную і культурную працу, таму выданне – каштоўная крыніца па гісторыі беларускага нацыянальнага руху ў міжваеннай Латвіі. Увагі заслугоўвае рубрыка *Беларускае жыццё у Латвіі*, у якой друкаваліся кароткія звесткі пра падзеі ў культурна-асветным жыцці латвійскіх беларусаў, дзейнасць беларускіх латвійскіх арганізацый. Ва ўмовах адсутнасці іншай беларускай прэсы, рэдакцыя газеты "Голас беларуса" свядома жадала быць своеасаблівым летапісцам беларускага жыцця ў Латвіі. Значную частку хронікі складаў К. Езавітаў, які ў розны час кіраваў або быў актыўным сябрам шэрагу беларускіх таварыстваў. У выніку на старонках перыёдыка падрабязна адлюстраваная гісторыя дзейнасці Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў, Беларускага навукова-краязнаўчага таварыства ў Латвіі, таварыства "Беларуская хата" і інш. Інфармацыю пра беларускія культурныя мерапрыемствы дасылалі карэспандэнты з месцаў – вясковыя, лудзенскія і даўгаўпілскія настаўнікі, актывісты мясцовых беларускіх таварыстваў, вучні старэйшых класаў беларускіх школ. У рубрыцы *Пісьмы і развагі чытачоў "Голасу беларуса"* ўздымаліся розныя тэмы. Складана вызначыць дакладную колькасць асоб, якія такім чынам супрацоўнічалі з перыёдыкам. У рэдакцыю пісалі людзі з правінцыі, выказваючы задавальненне тым, што

[596] Белорусс рабочий, *Почему мы должны уважать и защищать свой простонародный язык*, "Голас беларуса" 1925, № 12 ад 8 верасня, с. 1.

нарэшце беларусы Латвіі займелі ўласную газету. Яны дзяліліся думкамі і парадамі, дасылалі звесткі пра праявы культурна-асветнага руху ў сваіх мясцовасцях. У асноўным людзі пісалі пра тое, што самі арганізоўвалі альбо ў чым удзельнічалі[597].

У рубрыцы *Паштовая скрынка* рэдакцыя змяшчала адказы аўтарам і карэспандэнтам. На старонках газеты ўздымаліся эканамічныя пытанні звязаныя з доляй малазямельнага беларускага сялянства ў Латгаліі. Рэдакцыя крытыкавала эканамічную палітыку "буржуазнага" ўрада, які, на яе думку, змусіў малазямельных латагальскіх сялян перад абліччам голаду і галечы альбо наймацца парабкамі да буйных земляўласнікаў у Курляндыі, альбо шукаць працы ў гарадах, дзе таксама пануе беспрацоўе, альбо эміграваць на чужыну[598].

У *Літаратурным кутку* друкаваліся творы латвійскіх беларусаў (К. Езавітава, Я. Воркуля і інш.). Рубрыка выклікала зацікаўленасць з боку моладзі, асабліва маладых паэтаў, якія гарэлі жаданнем публікаваць уласныя творы. У чэрвені 1926 г., з нагоды першай гадавіны існавання, рэдакцыя адзначала, што адным з дасягненняў перыёдыка быў "*факт праяўлення ў Латвіі маладых беларускіх літаратурных сіл, выкліканых да жыцця з глыбіняў беларускае меншасці і накіроўваных да працы рэдакцыяй*"[599]. Дарэчы, цікавасць да супрацоўніцтва праяўлялі не толькі мясцовыя літаратары, але і тыя, хто жыў па-за межамі Латвіі[600].

Нярэдка на старонках "Голасу беларуса" асвятляліся палітычныя падзеі. Уласна, К. Езавітаў і заснаваў газету з намерам актывізаваць беларускую палітычную дзейнасць у Латвіі. На працягу 1925–1926 гг. на старонках газеты друкавалася поўная стэнаграма з судовага пасяджэння, якое адбывалася ў Латгальскім акруговым судзе. Гэта зрабіла "Голас беларуса" важнай

---

[597] *Пісьмы і развагі чытачоў "Голасу Беларуса"*, "Голас беларуса" 1925, № 8 ад 7 жніўня, с. 2.

[598] К. Сянкевіч, *Крызіс беларускае сялянскае гаспадаркі ў Латвіі*, "Голас беларуса" 1926, № 3 ад 20 красавіка, с. 2.

[599] *Нашы першыя ўгодкі*, "Голас беларуса" 1926, № 8 ад 10 чэрвеня, с. 1.

[600] 22 снежня 1926 г. да К. Езавітава звярнуліся студэнты з Мсціслава – Юлій Талбін (Таўбін) і Янка Панамароў, якія хацелі надрукаваць свае вершы на старонках "Голасу беларуса" (НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 132, л. 46). Галоўны рэдактар надрукаваў іх творы, але выйшла непаразуменне, бо маладыя аўтары разлічвалі атрымаць ганарары, чаго рэдакцыя не практыкавала. У лісце маладым калегам К. Езавітаў тлумачыў: "*Даражэнькія мае, атрымаў два Вашыя, вельмі нестрыманыя пісьма, на якія зазвычай не адказваю але Вы, відаць, не маеце ніякага паняцця аб тым, у якіх варунках жыве наша газета і наша меншасць, калі пішаце аб ганарару і крыўдзіцеся, што яшчэ яго не атрымалі. Папярэджваю, што мы ганарару за вершы і стацці ў нашай газеце не плацім. Наша газета існуе не для камерцыі, а для таго, каб змагацца за нашую меншасць і даць выхад творчым безгазетным сілам у Латвіі*" (НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 132, л. 49).

крыніцай па гісторыі беларускага працэсу. Аўтары і выдаўцы займалі лаяльную пазіцыю ў дачыненні да латвійскай дзяржавы і падкрэслівалі неабходнасць мацаваць латвійска-беларускае сяброўства. Разам з тым, яны крытыкавалі пазіцыя той часткі латышскага грамадства і палітычных сілаў, якія імкнуліся асіміляваць беларускую меншасць. Газета намагалася пераканаць латышскі бок, што беларускае насельніцтва не стварае пагрозы для тэрытарыяльнай цэласнасці латвійскай дзяржавы. Аўтары запэўнівалі, што латвійска-беларускія сваркі не адпавядаюць інтарэсам ніводнага з бакоў. Прыводзілася думка, што калі ў Латвіі не будзе беларусаў, дык застануцца рускія і палякі, якія будуць ствараць пагрозу маладой латвійскай дзяржаўнасці[601]. Стаўленне рэдакцыі да латвійскай дзяржавы можна падагульніць, цытуючы наступны ўрывак: "*Няхай як ёсць дагэтуль, беларусы застаюцца лаяльнымі й прыязнымі да латышоў і Латвіі, і няхай латышскі ўрад вернецца да нядаўняе свае палітыкі ў адносінах да беларусаў. Ад латвійскіх беларусаў залежыць няшмат – гэта не даць сябе нікому справакаваць. Але ад латвійскага ўрада залежыць вельмі шмат, ад яго ў поўнай меры залежыць, ці будуць адносіны нармальныя й прыязныя, ці наадварот, ненармальныя, з якіх скарыстаюць розныя, нашыя і латышскія, супольныя непрыяцелі*"[602].

У рубрыцы *Усякая-усячына* замяшчалася інфармацыя пра агульналатвійскія і сусветныя палітычныя падзеі. Рэдакцыя ў асноўным перадрукоўвала матэрыялы з іншых выданняў, скарачаючы. У першую чаргу намагаліся сачыць за падзеямі ў палітычным жыцці суседніх краін: Літвы, Польшчы і СССР. Больш увагі газета надавала міжнародным падзеям, якія наўпрост тычыліся беларусаў. Нягледзячы на цяжкую сітуацыю, у якой беларускі незалежніцкі лагер апынуўся пасля Рыжскага міру 1921 г., рэдактар "Голасу беларуса" аптымістычна глядзеў у будучыню. Ён пісаў: "*Рост беларускага нацыянальнага руху ідзе настолькі шпарка, што не можа быць і пытання аб тым, каб які-колечы суседні народ здолеў бы праглынуць і асіміляваць народ беларускі (...) Усё гэта высоўвае беларускае пытанне ў шэраг актуальнейшых палітычных пытанняў сучаснае Еўропы. І калі беларускае пытанне (...) не будзе ў памысным для беларусаў чыне вырашана ў бліжэйшыя гады, дык беларускае пытанне можа балканізаваць цэнтр Еўропы і быць прычынаю многіх неспадзяваных палітычных вынікаў*"[603].

---

[601] *Латышызацыя беларусаў*, "Голас беларуса" 1925, № 11 ад 4 верасня, с. 1; Давідовіч, *Латыска-беларускія адносіны*, "Голас беларуса" 1925, № 11, с. 1–2; *Як аўкнецца, гэтак і адгукнецца*, "Голас беларуса" 1925, № 14 ад 25 верасня, с. 1. *Палітычная блізарукасьць*, "Голас беларуса" 1926, № 42, с. 1.

[602] *Латышызацыя беларусаў*, "Голас беларуса" 1925, № 11 ад 4 верасня, с. 1.

[603] "Голас беларуса" 1927, № 58, с. 1.

У перыёдыку аналізаваліся таксама дачыненні з суседзямі. Цікавую пазіцыю аўтары займалі да літоўцаў. У адным артыкуле віталася ідэя літоўска-беларускага збліжэння, аднак не коштам беларускіх інтарэсаў. Гаворка ішла перадусім пра разыходжанні ў стаўленні да "віленскага пытання"[604]. Каментуючы сітуацыю вакол Вільні ў сувязі з польска-літоўскімі перамовамі ў Лакарне, галоўны рэдактар "Голасу беларуса" звяртаў увагу на тое, што літоўскія і польскія прэтэнзіі на Вільню не заўважалі права беларусаў, але ў рэшце рэшт будуць вымушаны лічыцца з апошнімі, бо пад уплывам БССР у Заходняй Беларусі расце беларуская нацыянальная свядомасць[605].

Выданне не абмінула ўвагай і дзяржаўны пераварот, які ў траўні 1926 г. у Польшчы здзейсніў Юзаф Пілсудскі. Стаўленне газеты да польскай палітыкі было адмоўным і адлюстроўвала пашыраны ў тагачасным беларускім нацыянальным лагеры пункт гледжання на Польшчу як на аднаго з галоўных ворагаў беларускай справы. Паўплывалі на гэта як фактычныя крокі тагачасных польскіх улад (Рыжская дамова 1921 г. і міжваенная палітыка асіміляцыі ў Заходняй Беларусі), так і сацыялістычныя перакананні галоўнага рэдактара "Голасу беларуса". Кастусь Езавітаў лічыў польскую дзяржаву не толькі прыгнятальніцай беларусаў, але таксама "буржуазна-капіталістычнай дзяржавай"[606]. Рэдакцыя не хавала адмоўнага стаўлення да спроб польска-латвійскага палітычнага збліжэння[607].

У аб'ектыў "Голасу беларуса" траплялі міжнародныя справы, якія ўскосна тычыліся беларускага пытання. Газета спачувала нацыянальным рухам, якія

---

[604] *Беларуска-літоўскія адносіны,* "Голас беларуса" 1925, № 6, с. 1; Ю. Гарэлік, *Народ з народам,* "Голас беларуса" 1925, № 6, с. 1; Ал. Галынец, *Голас беларуса,* "Голас беларуса" 1925, № 6, с. 1–2; *Беларусы ў Літве. Лёгіка літоўскіх адміністратараў,* "Голас беларуса" 1926, № 30. У 1926 г. на старонках "Голасу беларуса" з'явіўся перадрукаваны з "Савецкай Беларусі" артыкул *Справа Вільні*, аўтар якога пісаў: "*Новая Польшча аграбіла Вільню дарэшты і эканамічна, і культурна, адабраўшы ад яе тое, што заставалася нават пры царскім урадзе: значанне культурна-гаспадарчага цэнтру. Замест усяго гэтага Польшча зрабіла Вільню 'сталіцаю чарваватага адростка ў хранічным запаленні' (...) Але пець адходную Вільні яшчэ рана. Гісторыя не сказала яшчэ аб Вільні свайго апошняга слова. Сучасным становішчам незадаволеныя ўсе. Незадаволеныя перш за ўсё самі польскія імперыялісты, бачачы, што ўвапхнуліся ў свой глухі калідор, без сонца і свежага паветра, Вільня сохне, мізарнее, хварэе гаспадарчым і культурным малакроўем. Незадаволеная сучасная Літва, якая ў далучэнні да яе Вільні спадзяецца атрымаць новыя жыццёвыя сілы і сокі. Незадаволеныя мясцовыя дзеячы, без розніцы нацыянальнасці. Незадаволеныя рабоча-сялянскія масы Заходняй Беларусі. Усе, зацікаўленыя ў далейшай долі Вільні, кожны на свой лад, абмяркоўваюць пытанне аб гэтай долі. У сучасны момант Вільня належыць да Польшчы, але ці так будзе заўсёды?*". К. Езавітаў, *Віленскае пытаньне,* "Голас беларуса" 1926, № 6 ад 20 траўня, с. 2.

[605] *Выратовывайце, беларусы, сваю зямельку!*, "Голас беларуса" 1926, № 7 ад 1 чэрвеня, с. 1.

[606] Адраджэнец, *Пілсуцскі абманаў надзеі працоўных масаў і нацыянальных меншасьцяў Польшчы*, "Голас беларуса" 1926, № 9 ад 20 чэрвеня, с. 1.

[607] *Латвійска-польскі хаўрус праваліўся*, "Голас беларуса" 1927, № 54.

знаходзіліся ў сітуацыі, падобнай да беларускай. У прыватнасці, перыёдык пісаў пра становішча ўкраінцаў у Букавіне і дыскрымінацыю ў дачыненні да іх з боку румынскай дзяржавы[608]. Аўтары не хавалі прыхільнага стаўлення да македонскага руху і яго незалежніцкіх пастулатаў[609]. Асвятляючы дзейнасць агульнаеўрапейскіх канферэнцый нацыянальных меншасцей, якія адбываліся ў Жэневе, на старонках газеты выказваўся пэўны скептыцызм у дачыненні да мэтаў і заданняў, якія ставілі яе арганізатары. У газеце выказвалася думка, што беларусаў не могуць задаволіць пастулаты культурна-моўнай аўтаноміі, паколькі іх цікавіла нацыянальна-тэрытарыяльная аўтаномія[610].

"Голас беларуса" пісаў пра беларусаў у іншых краінах. Асвятлялася беларускае жыццё ў Заходняй Беларусі, Чэхаславакіі, Літве і ЗША[611]. У Празе, дзе навучаліся некаторыя латгальскія беларусы, газета мела ўласнага карэспандэнта, які паведамляў пра нацыянальна-культурныя дасягненні беларусаў у ЧСР. Тым часам сітуацыя беларусаў "пад Польшчай" падавалася выключна ў змрочных фарбах, адзіны ратунак бачыўся ва ўз'яднанні з Савецкай Беларуссю. Выданне пісала пра арышты і рэпрэсіі супраць беларускіх дзеячаў у Польшчы. Свядома ці несвядома, аўтары "Голасу беларуса" паказвалі дзейнасць прасавецкай партызанкі на паўночна-ўсходніх землях міжваеннай польскай дзяржавы як праяву змагання за беларускія нацыянальныя правы[612].

З рэестра выходных лістоў "Голасу беларуса" бачна, што рэдакцыя рупілася пра тое, каб газета трапляла ў Чыкага, Вільню, Коўна, Прагу ды пашыралася сярод мясцовага беларускага актыву. Улетку 1925 г. К. Езавітаў заклікаў Я. Варонку, Я. Чарапука, В. Ластоўскага, Т. Грыба, А. Цвікевіча, А. Ружанцова і М. Вяршыніна супрацоўнічаць і падтрымліваць выданне. Ліст з аналагічным зместам быў высланы Таварыству беларускай школы. Да ліку заходнебеларускіх перыёдыкаў, з якімі трымаў сувязь "Голас беларуса" належалі выданні "Праваслаўны беларус" і "Грамадзкі голас"[613].

Рэдакцыя "Голасу беларуса" не засталася ўбаку ад дыскусіі ў асяроддзі беларускіх інтэлектуалаў у сярэдзіне 1920-х гг. – наконт мэтазгоднасці ўжываць назву "Беларусь". В. Ластоўскі, Я. Станкевіч і іх прыхільнікі прапаноўвалі выкарыстоўваць іншы этнонім – "Крывія". Галоўны рэдактар "Голасу беларуса" не бачыў патрэбы ў новай назве, лічыў гэта шкодным для беларускага

---

608 *Румыны ўціскаюць украінцаў*, "Голас беларуса" 1925, № 7, с. 2.

609 К. Езавітаў, *Яшчэ адзін паняволены народ*, "Голас беларуса" 1927, № 58, с. 1.

610 К. Барысовіч, *Канфэрэнцыя нацыянальных меншасьцяў у Жэневе і беларусы*, "Голас беларуса" 1925, № 17, с. 1; *Даклад аб удзеле беларускае меншасьці ў агульна-эўрапейскіх канфэрэнцыях меншасьцяў*, "Голас беларуса" 1926, № 40.

611 *Беларусы ў Амэрыцы*, "Голас беларуса" 1927, № 54.

612 *Пашырэньне атаманскага руху*, "Голас беларуса" 1925, № 4, с. 3; Лад, *Сацыялізм і нацыяналізм*, "Голас беларуса" 1926, № 35 ад 3 лістапада, с. 1.

613 НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 135, л. 3.

руху. Хоць на пачатку беларускага адраджэння многія атаясамлівалі “Беларусь” з “Расіяй”, а беларусаў з “белымі” рускімі, аб’ектыўная хада гісторыі выправіла гэтую недарэчнасць, пісаў К. Езавітаў. Беручы пад увагу існаванне беларускай савецкай дзяржаўнасці, нацыянальны рух у Заходняй Беларусі і паразу белага руху ў Расіі, назва Беларусь трывала замацавалася за беларусамі, адзначаў ён[614].

Перыёдык пашыраўся рознымі шляхамі. Частка трапляла ў шапікі ў Рызе і Латгаліі. Напрыклад, № 1 газеты апынуўся ў шапіках Даўгаўпілса і Лудзы (па 15 асобнікаў), а таксама – Зілупе, Рэжыкнэ, Індры і Краславы (па 10 асобнікаў)[615]. Частку накладу К. Езавітаў высылаў у бібліятэкі, партнёрскім асобам, арганізацыям і выданням. У “абавязковы спіс” уваходзілі такія асяродкі, як – Латвійская дзяржаўная бібліятэка (Рыга), Беларускі архіў (Прага) і Беларуская дзяржаўная бібліятэка (Менск)[616]. Аднак большую частку накладу рэдакцыя высылала падпісчыкам. Каб павялічыць іх колькасць, у траўні 1926 г. рэдакцыя абвясціла конкурс на найлепшага распаўсюдніка газеты. Тыя, хто здолее сабраць не менш як 10 падпісчыкаў, атрымлівалі дармавую падпіску да канца 1926 г., брашуру “Беларускі працэс у Латвіі” і беларускія насценны і адрыўны календары. А таму, хто збярэ больш як 100 падпісчыкаў, апроч вышэйзгаданых бонусаў абяцалі срэбны гадзіннік[617].

Паўгадавая падпіска каштавала ад 3 да 5 латаў, а ў выпадку высылкі за мяжу адпаведна – 6 і 10. Выручкі з падпіскі не хапала, каб утрымліваць газету, выдаўцы мусілі шукаць дадатковыя сродкі. Дзеля гэтага быў створаны фонд выдання, у які фізічныя асобы і юрыдычныя суб’екты маглі пералічваць ахвяраванні. Заснавальнікі фонду спадзяваліся на дапамогу з боку мясцовай беларускай інтэлігенцыі. Галоўны рэдактар у першую чаргу разлічваў на настаўніцтва. У адным з лістоў жыхару Даўгаўпілшчыны К. Езавітаў пісаў:

---

[614] Галоўны рэдактар “Голасу беларуса” наступным чынам абгрунтоўваў сваю пазіцыю: “*Усе гэты здарэнні звязваюцца з імем Беларусі і беларускага народа. Далейшае ўмацаванне прынятае тэрміналогіі, па меры далейшага з намі знаёмства, – забяспечана (...) Запальчывасць, катэгарычнасць, паспешлівасць і нецярпімае адношанне да сваіх апанентаў выклікалі да гэтага новага руху незадаваленне з боку пераважнае большасці беларускага грамадзянства. Паднялася палеміка, у якой з абедзвюх старон не столькі займаліся паважным доследам патрэбы ці непатрэбнасці, карыснасці ці шкоднасці гэтага руху для беларускае адраджэнчае працы, сколькі ўзаемна асабіста зневажалі адзін аднаго. Нам здаецца, што ад такога метаду дыскусіі высвятленне справы ўперад не пасунецца*”. *Беларусь і Крывія*, “Голас беларуса” 1925, № 8 ад 18 жніўня, с. 1.

[615] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 135, л. 5.

[616] Дзякуючы гэтаму сёння большасць накладу газеты захоўваецца не толькі ў Латвіі, але таксама ў Беларусі (Нацыянальная бібліятэка Беларусі) і Чэхіі (Славянская бібліятэка Нацыянальнай бібліятэкі Чэшскай Рэспублікі).

[617] *Конкурс на пашырэньне газэты “Голас беларуса”*, “Голас беларуса” 1926, № 6 ад 20 траўня, с. 2.

"*Добра будзе, калі Вы на вашай вёсцы збярэце ахвяры на газету/можна не толькі грашмі, але і бульбай і жытам, якое потым трэба прадаць у Індры, а грошы выслаць на Рэдакцыю*"[618]. У чэрвені 1925 г. на фонд выдання газеты "Голас беларуса" К. Езавітаў атрымаў ад настаўнікаў і служачых Даўгаўпілскай беларускай гімназіі – 21 100 латвійскіх рублёў, ад настаўнікаў і служачых Лудзенскай беларускай гімназіі – 8 800, ад іншых грамадзян – 16 350. Разам да 20 чэрвеня 1925 г. было атрымана 46 250 латвійскіх рублёў[619].

Аднак выдаўцы разумелі, што ўласных ахвяраванняў недастаткова, каб выдаваць паўнавартую газету. Незаможнае і нешматлікае беларускае настаўніцтва не было ў стане збіраць значныя сумы. Неабходна было шукаць заможных спонсараў. Пошук фундатараў спрашчалі асабістыя знаёмствы К. Езавітава з беларускім актывам за мяжой, у прыватнасці ў ЗША. У 1925 г. Беларускі нацыянальны камітэт у штаце Ілінойс падтрымаў грашыма газету[620]. Іншай крыніцай фінансавання стала кіраўніцтва Кампартыі Беларусі. 31 ліпеня 1925 г. сакратарыят ЦК КП(б)Б пастанавіў субсідыяваць "Голас беларуса". Было вырашана прызначыць на гэтую мэту 300 рублёў[621]. У 1926 г. Менск спансараваў выданне на сталай аснове[622]. Замежная дапамога, асабліва з савецкіх крыніц, палепшыла матэрыяльнае становішча газеты. Фінансавы стан выдання яскрава адлюстроўвае перыядычнасць. У 1926 г. яна выходзіла больш-менш рэгулярна і дасягнула піку сваёй дзейнасці. У верасні таго года выйшлі два нумары ў павялічаным памеры. Восенню 1926 г. газета змяніла тыпаграфію і адрас рэдакцыі (*Ģertrūdes iela 80*), што пазітыўна паўплывала на тэмп выдання[623].

Крыніцы фінансавання газеты ўплывалі на яе змест. Асабліва гэта тычыцца стаўлення да Савецкага Саюза. Істотнае месца ў газеце займала рубрыка "У Радавай Беларусі", дзе публікаваліся матэрыялы пра грамадска-палітычнае і культурнае жыццё БССР. Узамен за грашовую падтрымку савецкі бок чакаў, што ў перыёдыку будуць дамінаваць артыкулы, адпаведныя палітычным і ідэалагічным мэтам СССР. Упаўнаважаны НКЗС СССР пры ўрадзе БССР Сяргей Казюра лічыў мэтазгодным фінансаванне газеты "Голас беларуса", паколькі яна карысталася попытам у беларускага насельні-

---

618 LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., Ліст К. Езавітава да NN, 10 лістапада 1925 г.

619 *Ахвяры на "Голас беларуса"*, "Голас беларуса" 1925, № 3 ад 1 ліпеня, с. 4.

620 НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 135, л. 11.

621 *Знешняя палітыка Беларусі. Зборнік дакументаў і матэрыялаў. Т. 2. 1923–1927*, рэд. У. Міхнюк і інш., Менск 1999, с. 158.

622 Д.А. Короткова, *Поиски союзника. Контакты советских дипломатов в Латвии с К.Б. Езовитовым в 1925–1926 гг.*, "Славянский мир в третьем тысячелетии" 2020, т. 15, № 1–2, с. 51.

623 *Рэдакцыя "Голасу Беларуса" пераезжае у новае памешканьне*, "Голас беларуса" 1926, № 20 ад 15 верасня, с. 4.

цтва. Дыпламат адзначаў, што, дзякуючы савецкай дапамозе, у 1926 г. газета "Голас беларуса" ўзнавіла выданне і "*к настоящему времени выходит регулярно три раза в месяц и приняла, в условиях латышской цензуры, вполне приемлемый для нас вид*"[624]. Газета сапраўды ператварылася ў рупар прасавецкай агітацыі сярод мясцовых беларусаў. На старонках "Голасу беларуса" дарэмна шукаць крытычных артыкулаў, прысвечаных усходняму суседу Латвіі і яго палітыцы. Выданне ўслаўляла беларускую савецкую рэчаіснасць. Публікацыі, прысвечаныя Савецкай Беларусі, вызначаліся некрытычнасцю і ідэалізацыяй. Выданне стварала выключна станоўчы вобраз савецкай рэчаіснасці, асвятляючы поспехі нацыянальна-культурнага і эканамічага развіцця БССР. Віталіся захады партыйнага кіраўніцтва, скіраваныя на беларусізацыю жыцця ў Беларускай ССР[625]. Асаблівае захапленне ў рэдакцыі выклікалі дасягненні ў галіне асветы, навукі і культуры[626].

З цягам часу колькасць матэрыялаў, прысвечаных Савецкай Беларусі, расла. Тон прасавецкім поглядам на старонках газеты задаваў яе галоўны рэдактар. Большасць ухвальных публікацый належала менавіта К. Езавітаву. Апошні не шкадаваў кампліментаў для бальшавіцкай палітыкі каранізацыі, падаючы яе як узорную праяву нацыянальнай талерантнасці[627]. Ён і іншыя аўтары адзначалі слушнасць замежнай палітыкі "рэвалюцыйнага Усходу" – адзінай, на іх думку, сілы, якая падтрымала нацыянальна-дзяржаўныя імкненні беларусаў[628].

Асобнай увагі аўтараў "Голасу беларуса" заслугоўвала нацыянальная палітыка ў Савецкай Беларусі, у прыватнасці ўзбуйненне тэрыторыі

---

[624] *Знешняя палітыка Беларусі. Зборнік дакументаў і матэрыялаў. Т. 2. 1923–1927*, рэд. У. Міхнюк і інш., Менск 1999, с. 214, 215.

[625] *Рашучы пераход радавай улады на Беларусі да нацыянальнае палітыкі*, "Голас беларуса" 1925, № 16, с. 3.

[626] *У Радавай Беларусі. Народная прасьвета ў БССР*, "Голас беларуса" 1925, № 9, с. 1–2; Кастусёнак, *Беларуская Акадэмія Навук*, "Голас беларуса" 1926, № 34, с. 1. К. Езавітаў, *Першая Беларуская Акадэмічная Канфэрэнцыя. Падарожжа–Уражаньні–Вынікі)*, "Голас беларуса" 1926, № 27 ад 8 снежня, с. 1; *Жыцьцё ў Беларускай Савецкай Рэспубліцы*, "Голас беларуса" 1929, № 60.

[627] У адной з публікацый К. Езавітаў пісаў: "*Беларуская савецкая ўлада надала гэтым латышскім каланістам права нацыянальнае аўтаноміі і пры гэтым не толькі аўтаноміі нацыянальна-культурнае, але і нацыянальна-тэрытарыяльную аўтаномію*". *Латыская нацыянальная меншасьць у Савецкай Беларусі*, "Голас беларуса" 1926, № 3 ад 20 красавіка, с. 2.

[628] Гэта думка наступным чынам развівалася ў адной з публікацый: "*Беларускія масы пачынаюць спадзявацца на тое, што гэта аб'яднанне можа абысціся і без вялікіх ахвяраў з боку беларускіх працоўных і сялянства. Кашмар думак аб безвыхаднасці становішча, аб патрэбе вялікае крывавае бойкі за беларускае аб'яднанне пачынае развейвацца і патроху змяняецца на тое, што ўсё абыдзецца мірным шляхам, без грому гарматаў і руччоў беларускае крыві*". *Што дае Беларусі далучэньне Гомельшчыны,* "Голас беларуса" 1926, № 47, с. 1; Гл. таксама артыкул В. Ластоўскага: *Няхай нас сустрэнуць палямі, лясамі грамады працоўных людзёў*, "Голас беларуса" 1927, № 55.

БССР. У адным з артыкулаў чытаем: "*Урад Савецкае Беларусі без усялякіх войнаў і боек, крок па кроку, паволі, але зусім пэўна, аб'еднывае беларускія землі (...) Цяперака паднята пытанне аб далейшым далучэнні да Савецкае Беларусі тых беларускіх абшараў на паўдзённым усходзе і поўначы, якія яшчэ часова ўваходзяць у склад РСФСР (...) Трэба чакаць, што ў бліжэйшыя дні справа гэта ўжо аканчальна вырашыцца і Савецкая Беларусь атрымае новыя беларускія тэрыторыі*"[629]. Рэдакцыя не хавала задавальнення такім ходам падзей і разлічвала, што працэс тэрытарыяльнага ўзбуйнення БССР будзе працягвацца[630]. Аўтар артыкула *Беларускі рух у Смаленшчыне* выказаў спадзяванне на хуткае далучэнне Смаленскай вобласці да БССР, а таксама скардзіўся на павольныя тэмпы беларусізацыі дадзенага рэгіёну: "*Ці не пара ўжо беларусам павыкідаць са сваёй зямелькі тых паноў і падпанкаў, што ўцалелі на Беларусі ад ганебных часоў расейскага царызму, што дагэтуль усё яшчэ займаюцца русіфікацыяй беларускае люднасці і змагаюцца з беларускім адраджэнчым рухам? Тады справа беларускае школы ў Смаленшчыне, як і наагул, шпарка пайшоўшы па Смаленшчыне беларускі адраджэнчы рух, не будзе затрымлівацца рукамі нашых ворагаў*"[631]. У адным з артыкулаў К. Езавітаў выказваў неразуменне, чаму Смаленшчына і Браншчына ўсё яшчэ ўваходзяць у склад "Маскоўшчыны"[632]. Разам з тым, беларускі дзеяч не траціў надзеі, што далучэнне да БССР гэтых абшараў "ужо не за гарамі"[633].

---

[629] *Савецкая Беларусь зьбіраець беларускія землі,* "Голас беларуса" 1926, № 18 ад 25 жніўня, с. 1; Гл. таксама: *Новае пашырэньне межаў Беларускае Савецкае Рэспублікі*, "Голас беларуса" 1926, № 46, с. 1.

[630] У сувязі з далучэннем Гомельшчыны да БССР газета "Голас беларуса" не хавала эйфарыі: "*Мы, беларускія нацыянальныя дзеячы, не можам не прывітаць гэтага новага мірнага здабытку беларускага народа, гэтага новага акту на шляху да справядлівага задавальнення нацыянальна-суверэнных правоў Беларусі, аднак мы не можам выказаць свайго здзіўлення і жалю з поваду таго, што Гомельчшына далучана да Беларусі не цалком, а чамусьці разарвана на дзве часткі, з якіх адна па праву перададзена Беларусі, а другая, без зразумелых для нас падстаў, зноў на невядомы час затрымана ў складзе Маскоўшчыны. Шчыра вітаючы Беларусь з гэтым новым нацыянальным здабыткам, мы спадзяёмся, што яна гэтак жа бяскроўна і мірна атрымае і тыя беларускія часткі Смаленшчыны, Себежчыны і Невельшчыны, якія асталіся пакуль што ў складзе Маскоўшчыны. Разам з тым, мы моцна верым і ў тое, што ўмацаваная на Усходзе Беларусь не дасць загінуць сваім братом у Заходняй Беларусі і знойдзе сілы і спосабы выратаваць іх з-пад гвалтоўнага ўціску бяспраўнае польскае акупацыі. Няхай жыве Непадзельная Беларусь!*" *Новае пашырэньне Беларускае Савецкае Рэспублікі*, "Голас беларуса" 1926, № 28 ад 15 снежня, с. 1.

[631] *Беларускі рух у Смаленшчыне*, "Голас беларуса" 1926, № 3 ад 20 красавіка, с. 2.

[632] У адным з артыкулаў К. Езавітаў адзначаў: "*Савецкая Беларусь не змагла здзейсніць усіх летуценняў беларускага народа (...) не здолела зрабіць яшчэ самага галоўнага, не здолела сабраць у адно цэлае ўсіх беларускіх зямель*". "Голас беларуса" 1927, № 58, с. 1.

[633] *Беларушчына ідзе на ўсход*, "Голас беларуса" 1925, № 11, с. 1; *Новае пашырэньне межаў*

Рэдакцыя "Голасу беларуса" падтрымлівала кантакты з некаторымі савецкімі выданнямі ("Труд", Полымя", "Известия"), з якімі ладзіла абмен нумарамі. На старонках сваёй газеты К. Езавітаў перадрукоўваў матэрыялы з бээсэсэраўскай прэсы. Увагу да савецкай праблематыкі галоўны рэдактар тлумачыў тым, што яго газета была адным з нешматлікіх перыёдыкаў у Латвіі, які ўвогуле цікавіўся справамі Савецкай Беларусі[634].

Усё гэта сведчыць пра тое, што нэпаўская палітыка бальшавікоў прывабна выглядала ў вачах выдаўцоў газеты, захапляла іх розумы і сэрцы. Такім чынам, назіраўся штораз больш выразны ўхіл выдання "ўлева", што знайшло адлюстраванне нават у назве. Пачынаючы з 1927 г., газета выходзіла з падзагалоўкам "Сялянска-работніцкая тыднёвая газета". На прасавецкую арыентацыю рэдакцыі звярталі ўвагу чытачы розных нацыянальнасцей. Напрыклад, падчас пасяджэння ўправы Рускага нацыянальнага саюза ў Латвіі (27 лістапада 1926 г.) намеснік старшыні гэтай арганізацыі М. Барданос азнаёміў удзельнікаў з беларускім нацыянальным рухам, адзначаючы, што на старонках беларускага перыёдыка з'яўляюцца публікацыі, аўтары якіх малююць "*заманчивую картину 'советского рая', в частности БССР, где будто бы процветают и сельское хозяйство, и детское воспитание, и наука, и где с распростертыми обьятьями будет встречена учащаяся молодежь из Латвии, для котор. предназначено достаточное число стипендий. Вообще, симпатии к БССР к латвийским белоруссам простираются до того, что ЦК МОПРА принял шефство над Двинской политической тюрьмой*"[635]. Аўтар выказаў меркаванне, што беларуская газета фінансуецца Міжнароднай арганізацыяй дапамогі барацьбітам рэвалюцыі (створанай Камінтэрнам у 1922 г.), а колькасць падпісчыкаў не перавышае 30[636].

Захапленне галоўнага рэдактара беларускага перыёдыка "святлом з Усходу" не падабалася многім беларускім чытачам. У прыватнасці, пагоршылася стаўленне да яго з боку амерыканскіх беларусаў, якія адмовіліся працягваць фінансаваць выданне. Галоўны рэдактар "Голасу Беларуса" скардзіўся, што Язэп Варонка і Янка Чарапук лічылі яго выданне "задужа левым". У адным з лістоў (3 студзеня 1927 г.) Аляксандру Чарвякову ён пісаў: "*Беларускі нацыянальны камітэт у Чыкага патрабуе, каб я змяніў напрамак 'Голасу' і пачаў лаяць Менск. Гэта становішча варункам дапамогі. Я на*

Беларускае Савецкае Рэспублікі, "Голас беларуса" 1926, № 46, с. 1.

[634] У лісце А. Чарвякову К. Езавітаў адзначаў: "*Радавых газет прыватным асобам [у Латвіі] атрымліваць няможна, а ніводная з тутэйшых газет нічога аб Беларусі не піша*". LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 183 lp., Ліст К. Езавітава да А. Чарвякова, 15 жніўня 1927 г.

[635] *В Русском Национальном союзе*, "Сегодня вечером" 1926, № 269 от 29 ноября, с. 4.

[636] А. Чарняўскі, *Выдавецкая дзейнасць беларускай нацыянальнай меншасці ў міжваеннай Латвіі (1918–1940 гг.)*, "Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Серыя 1. Гісторыя і археалогія. Філасофія. Паліталогія" 2023, т. 15, № 3, с. 63.

гэта не згадзіўся. Дык яны пачалі друкаваць сваю ўласную газету ў Чыкага. Магчыма, што з зачыненнем майго 'Голасу' чыкагская 'Трыбуна' будзе адзінаю беларускаю газетаю за межамі Беларусі"[637].

Аднак савецкая падтрымка выдання "Голас беларуса" працягвалася нядоўга, паколькі ўжо на мяжы 1926 і 1927 гг. паміж галоўным рэдактарам і прадстаўнікамі савецкага боку абвастрыліся рознагалоссі і непаразуменні. На думку апошніх, К. Езавітаў не жадаў цалкам падпарадкоўваць газету савецкім патрабаванням і не пагаджаўся мяняць яе фармат, як патрабавалі прадстаўнікі БССР[638]. Праўда, упаўнаважаны прадстаўнік СССР у Латвіі Аляксей Чарных прызнаваў, што змест "Голасу беларуса" пакідае жадаць лепшага, але пралікі ў дзейнасці яе рэдактара тлумачыў тым, што К. Езавітаў толькі нядаўна пачаў атрымліваць савецкія выданні "Звязда" і "Савецкая Беларусь", а раней не меў адкуль чэрпаць інфармацыю пра БССР. Дыпламат дадаваў, што беларускі дзеяч абяцаў яму выправіць памылкі[639]. Нягледзячы на гэтыя абяцанні, у Менску было вырашана спыніць супрацоўніцтва з К. Езавітавым (гл. наступны раздзел).

Спыненне амерыканскіх і савецкіх субсідый адмоўна паўплывала на становішча газеты, якая мела ўсё большыя матэрыяльныя клопаты. Яскрава сведчаць пра гэта лісты К. Езавітава. 8 жніўня 1928 г. ён пісаў А. Чарвякову: "*На гвалт патрэбна цяперака, каб выходзіў 'Голас беларуса', але грошы зусім няма, бо вучыцельства стэрарызавана Пігулеўскім і не хоча, як было раней, надсылаць ахвяры на выданне. Варонка таксама адмовіўся ад падтрымкі газеты, бо не згодзен з яе кірункам, які ён лічыць задужа левым*"[640]. Тым не менш, аўтар радкоў не губляў надзеі, разлічваючы на ўласныя сілы і заклікаючы падпісчыкаў ахвяраваць[641]. Падтрымка з боку беларускага настаўніцтва таксама змяншалася пасля канфлікту К. Езавітава з кіраўніком БША[642].

---

[637] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., Ліст К. Езавітава да Аляксандра Чарвякова, 3 студзеня 1927 г.

[638] Д.А. Короткова, *Поиски союзника. Контакты советских дипломатов в Латвии с К.Б. Езовитовым в 1925–1926 гг.*, "Славянский мир в третьем тысячелетии" 2020, Том 15, № 1–2, с. 54.

[639] Д.А. Короткова, *Поиски союзника. Контакты советских дипломатов в Латвии с К.Б. Езовитовым в 1925–1926 гг.*, "Славянский мир в третьем тысячелетии" 2020, Том 15, № 1–2, с. 51–52.

[640] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., Ліст К. Езавітава да Аляксандра Чарвякова, 8 жніўня 1928 г.

[641] Рэдакцыя заклікала сваіх падпісчыкаў: "*Усіх свядомых беларусаў заклікаемо складаць на газету ахвяры, заахвочваць новых падпісчыкаў і надсылаць весткі аб сваім жыцці. Толькі моцнае згуртаванне вакол сваёй роднай газеты выратуе беларусаў ад дэнацыяналізацыі з'арганізуе іх у моцны хаўрус і зможа правясці да перамогі ў барацьбе за нашыя беларускія нацыянальна-сацыяльныя ідэалы*". *Рэдакцыя "Голасу Беларуса" пераезжае ў новае памешканьне*, "Голас беларуса" 1926, № 38.

[642] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., Ліст К. Езавітава да З. Жылуновіча, без даты.

У выніку, пачынаючы з 1927 г., газета перажывала фінансавы крызіс. Яна выходзіла рэдка і нерэгулярна. К. Езавітаў не мог засяродзіцца на выдавецкай працы. Ён мусіў выдаваць асобныя нумары, каб не страціць ліцэнзію. Праз нястачу грошай яму не ўдалося выдаць нумар за 29 снежня 1927 г., хоць дамова з друкарняй дзейнічала да канца года. Галоўны рэдактар быў вымушаны плаціць за тое, што не выйшла. З лістоў К. Езавітава суайчыннікам у БССР прамаўлялі роспач і адчай. У адным з іх чытаем: "*Навагоднія настроі мае зусім дрэнныя, а галоўнае кепска тое, што няма пэўнасці, што яны паправяцца ў бліжэйшай будучыні. Справа ж з 'Голасам' стаіць зусім кепска, бо апошнія месяцы прыходы мае зрабіліся вельмі малымі (за кастрычнік – 200 даляраў, за лістапад – 150 дал., а за снежань дык зусім нічога). Па інерцыі працаваў апошнія тыдні пасля свайго звароту з Менску ў крэдыт, але далей рабочыя не згаджаюцца. Апошні нумар выйшаў 22 снежня, але да гэтага часу не разасланы, бо кантора стала. 29-га снежня нумар ужо не выйшаў зусім. Заўтра трэба было б рыхтавацца да выпуску чарговага нумара (выходзіў па серадах), але і паслязаўтрашні нумар не выйдзе. А тутака яшчэ гора, што з тыпаграфіяй падпісаны кантракт на год і з няўстойкай, друкуй-не друкуй, а за тыпаграфію трэба плаціць. Хоць ты ў пятлю лезь. Ніколі ў жыцці сваім не быў у гэткім дурацкім становішы. У снежні ледзь-ледзь выкруціўся з вэксалямі, згадзіўшыся перапісаць іх на два месяцы з налічэннем шалёнага працэнту. Адзін з гэтых месяцаў ужо мінае, а што я буду рабіць 15-га лютага, калі наступяць плацяжы, дык і сам не ведаю. Цяперака заняты тым, што шукаю сабе хоць якую-колечы пасаду, хаця ж бы вучыцеля ў пачатковай школе, адначасна з гэтым шукаю літаральна капеечнага крэдыту на асабістае пражыванне*"[643].

Патрэба ва ўласнай прэсе адчувалася асабліва напярэдадні парламенцкіх выбараў, якія адбыліся ў 1928 г. У лісце да А. Чарвякова галоўны рэдактар "Голасу беларуса" пісаў: "*Даражэнькі Алесь, пішу да цябе ў вельмі сумным і нават роспачным настроі: справа ў тым, што 'Голас беларуса', які я з такой энергіяй і напружаннем вёў два з паловай гады, вось ужо больш месяца як не выходзіць. Да выбараў у Латвійскі Сойм застаецца ўсяго год часу. Усе партыі прыступілі гэтым летам да ўпартага змагання і падрыхтоўкі. Толькі, мы, беларусы, зноў апынуліся без свайго друкаванага слова, бо далей я цягнуць ужо не змог. Заела лютае безграшоўе. Я змушаны быў прыняць пасаду настаўніка Рыжскае пачатковае школы і цяперака ўсю зіму буду займацца паступовым пагашэннем сваіх даўгоў па 'Голасу беларуса'. Пры такіх варунках няцяжка сказаць, якія будуць вынікі выбарчае беларускае кампаніі ў наступным годзе. Беларускае грамадства ўжо цяперака нервуецца, запытвае мяне, чаму няма газеты, імкнецца да яе, але што ж зробіць:*

[643] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 184 lp., Ліст К. Езавітава да А. Чарвякова, 3 студзеня 1927 г.

нашаму тутэйшаму сялянству і рабочым, змучаным беззямеллем і бесправоўем, не па кішэні ўтрымка сваёй часопісі, а інтэлігенцыі на пасадах у нас мала, ды і апрача газеты ўся яна перагружана ўсялякімі іншымі адлічэннямі: на вопратку, на абутак, на кніжкі і сшыткі дзецям нашых школ. І так 'Голас' – стаў, замоўк"[644]. У іншым лісце К. Езавітава чытаем: "*Не пісаў табе шмат часу таму, што не соладка мне тутака жылося: даўгі выплачваў па 'Голасу беларуса', жонку звольнілі з пасады, дык усю зіму працаваў у трох месцах – у пачатковай школе, у школе для дарослых і на настаўніцкіх курсах – быў заняты і ўдзень, і ўвечары да глыбокае ночы. Дужа стаміўся, але вылез неяк*"[645].

Нягледзячы на матэрыяльныя цяжкасці, газета працягвала выходзіць яшчэ нейкі час. Але той выхад быў хутчэй сімвалічны, чым рэальны. У 1928 г. свет пабачыў толькі адзін нумар. У 1929 г. галоўны рэдактар "Голасу беларуса" наступным чынам тлумачыў становішча газеты і яе ідэйны напрамак: "*Як ні цяжка матэрыяльнае становішча адзінае беларускае газеты на ўсю Прыбалтыку 'Голас беларуса', аднак яна з усіх сіл змагаецца за жыццё. У гэтым годзе газета ўжо ўвайшла ў 5-ты год свайго існавання. Цікавасць беларускага жыхарства да свае газеты дужа вялікая, але большасць сялян зусім не мае сродкаў на тое, каб быць сталымі падпісчыкамі, ды апрача таго дэзарганізуючыя ўплывы на масу робяць безграшова рассылаемыя па ўсей Латгаліі лісткі розных латышскіх і расейскіх партыйных груповак, якія маюць даволі сродкаў, каб засыпаць правінцыю сваімі газетамі. Таму 'Голасу беларуса', які не мае ніскуль ніякае падтрымкі, прыходзіцца выхадзіць дужа рэдка і кажны нумар навальваецца цяжкім камянём на бюджэт выдавецтва, бо тыраж (платны) зусім маленькі, а выдаткі даволі значныя. Дужа адбіваецца на грашовым стане газеты і тое, што правыя, больш заможныя беларускія групоўкі, знаходзяцца пад уплывамі беларускіх угадовых арганізацый і адзінак, якія знаходзяць, што 'Голас беларуса' займае дужа левую пазіцыю і сварыцца з сучасным рэакцыйным урадам Латвіі. Гэтыя грамадзяне баяцца надсылаць падпіску, каб 'за гэта не было б чаго'*"[646].

На 4-ым з'ездзе прадстаўнікоў беларускіх арганізацый Латвіі (красавік 1929 г.) дэлегаты сабралі складкі на газету, але, як адзначала рэдакцыя, тых сродкаў не хапала на выданне[647]. Увесну 1929 г. К. Езавітаў прапанаваў сябрам Рады БША абавязаць усіх беларускіх настаўнікаў падпісацца на "Голас беларуса", па 10 асобнікаў якога штомесяц прызначыць на патрэбы вучняў[648].

---

644 LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 183 lp., Ліст К. Езавітава да А. Чарвякова, 15 жніўня 1927 г.

645 LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 183 lp., Ліст К. Езавітава да А. Чарвякова, 8 жніўня 1928 г.

646 LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 212 lp.

647 *Да чытачоў і прыхільнікаў "Голасу Беларуса"*, "Голас беларуса" 1929, № 60.

648 НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 17, л. 9.

Аднак газета доўга не пратрымалася, а на працягу 1929 г. удалося выдаць толькі два нумары, якія аказаліся апошнімі. Усяго за перыяд існавання выдання (1925–1929) пабачыў свет 61 нумар.

Падсумоўваючы гісторыю газеты "Голас беларуса" належыць падкрэсліць, што гэта было першае і нейкі час адзінае беларускае перыядычнае выданне ў Латвіі. Аналізуючы змест, належыць, аднак, памятаць, што на ім адбіўся дух часу. Перадусім звяртае ўвагу крайне левая і прасавецкая арыентацыя выдання, аднак такія погляды не былі рэдкасцю ў асяроддзі беларускае інтэлігенцыі ў 1920-я г. як у Латвіі, так і па-за яе межамі. Ідэйны напрамак перыёдыка адлюстроўваў складанасць і вастрыню праблем, з якімі ў разгляданы час сутыкнуўся беларускі нацыянальны рух.

Яшчэ адным "даўгавечным" выданнем латвійскіх беларусаў з'яўляўся ілюстраваны часопіс **"Беларуская школа ў Латвіі"**, які выходзіў ў Рызе. Спачатку гэта быў прысвечаны педагагічным справам дадатак да газеты "Голас беларуса". Аднак, пачынаючы з № 4 (люты) за 1927 г., часопіс ператварыўся ў самастойны навукова-папулярны, педагагічны і літаратурна-грамадскі штомесячнік. Пачынаючы з № 6 (красавік) за 1927 г., перыёдык выходзіў як "Педагагічна-грамадскі штомесячнік беларускай нацыянальнай меншасці ў Латвіі". Рэдакцыя знаходзілася па адрасе: *Alberta iela 5/9,* а друкаваўся часопіс у тыпаграфіі Левіна (*Dzirnavu iela 33*), а потым у друкарнях па адрасе *Gertrūdes iela 80* і *Vecpilsētā iela 8*[649]. Пачынаючы з № 8 (красавік 1928 г.), выдаўцам перыёдыка было Таварыства беларускіх настаўнікаў у Латвіі. Пасаду галоўнага рэдактара цягам усяго існавання часопіса займаў К. Езавітаў. У асноўным ён адказваў за працу па зборы і падрыхтоўцы матэрыялаў. Супрацоўнікамі рэдакцыі ў розны час былі П. Масальскі, настаўнікі Анастасія Крэйц і Станіслаў Красневіч, студэнты Казімір Мяжэцкі, Алесь Вайноўскі (наборшчык), Пятро Журкоўскі, Валянціна Казлоўская, Міхась Калінін, Якуб Воркуль, М. Вайноўская, К. Сташкевіч (друкар), слухачка драматычных курсаў Варвара Крэйц. Акрамя галоўнага рэдактара, на старонках часопіса гасцявалі С. Сахараў, С. Казека, А. Барткевіч, Б. Брэжга і інш.

Асноўнай праблематыкай выдання былі педагогіка і асвета латвійскіх беларусаў. На старонках часопіса друкаваліся справаздачы ТБНЛ, артыкулы на тэмы педагогікі, агляды падзей беларускага школьнага жыцця, метадычныя парады настаўнікам, рэцэнзіі і агляды новай літаратуры і падручнікаў. У прыватнасці, на старонках часопіса можна знайсці агляды прац В. Ластоўскага *Гісторыя Беларускай (Крыўскай) кнігі: спроба паясніцельнай кнігапісі ад канца X да пачатку XIX стагодзьдзя* (Коўна 1926). Галоўны рэдактар атрымаў 10 асобнікаў гэтай кнігі дзеля распаўсюду сярод

[649] M. Jankowiak, *Prasa białoruska międzywojennej Łotwy (przegląd wydawnictw)*, "Studia Białorutenistyce" 2021, t. 15, s. 21.

беларускага настаўніцтва ў Латвіі. Чытачоў заахвочвалі купляць новую кнігу[650]. Акрамя таго, перыёдык перадрукоўваў артыкулы па методыцы выкладання (напрыклад, працу "Як вучыць у новай школе"). Часопіс "Беларуская школа ў Латвіі" быў разлічаны не толькі на настаўнікаў, але і на вучняў старэйшых класаў. З 1929 г. у выданні была рубрыка *Лепшыя працы вучняў беларускіх школ у Латвіі*, у якой друкаваліся вучнёўскія сачыненні (напрыклад: *Як я правёў лета ў 1928 годзе*). Перыёдык меў амбіцыі стварыць своеасаблівую хроніку беларускай школьнай справы ў Латвіі. Дзеля гэтага з 1932 г. рэдакцыя друкавала матэрыялы, якія атрымлівала са школ.

Выданне "Беларуская школа ў Латвіі" ахоплівала значнае кола тэмаў, якія выходзілі па-за межы адукацыі. На старонках з'яўляліся матэрыялы, прысвечаныя гісторыі і культуры Беларусі (*Вынікі этнаграфічнага дасьледаваньня Себежчыны, Невальшчыны і Вяліжчыны*, *Да гісторыі зьбіраньня і гарманізацыі беларускай народнай песьні*, *Да гісторыі распаду Беларускае Народнае Рэспублікі*, *Літоўская Мэтрыка і яе каштоўнасьць для вывучэньня мінуўшчыны Беларусі*). Рэдакцыя сачыла за працай іншых беларускіх таварыстваў ("Беларуская хата", "Прасвета", Таварыства беларускай моладзі ў Латвіі і інш.), публікуючы абвесткі і зацемкі пра мерапрыемствы, якія яны ладзілі. Рэдакцыя звярталася да кіраўніцтва беларускіх культурна-асветных таварыстваў з просьбай дасылаць падрабязныя звесткі пра сябе і сваю працу[651]. Асабліва плённым было супрацоўніцтва з Беларускім навукова-краязнаўчым таварыствам. Часопіс публікаваў вынікі працы апошняга ў выглядзе матэрыялаў пра беларускую народную творчасць Латгаліі і Ілукшчыны. У жніўні 1933 г. рэдакцыя распрацавала ананімную анкету, каб высветліць, як латвійскія беларусы ацэньваюць працу сваіх арганізацый і што можна палепшыць[652]. Часопіс не пакідаў па-за ўвагай дзейнасць беларускіх тэатральных груп. Нярэдка на старонках перыёдыка даваліся агляды становішча беларусаў у іншых краінах (Літве, Польшчы)[653].

Часопіс браў удзел у нацыянальнай агітацыі. На яго старонках хапала матэрыялаў патрыятычнага характару, заклікаў да беларусаў, каб далучаліся да культурна-асветнай працы. Нават сёння ўзнёсла гучаць словы выдаўцоў "Беларускай школы ў Латвіі" скіраваныя да суайчыннікаў: "*Той чалавек, які*

---

650 *"Гісторыя Беларускай Кнігі" для беларускіх настаунікаў у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1927, № 6(4), с. 82.

651 LVVA, 1826 f., 1 ap., 1006 l., 24 lp.

652 *Што трэба зрабіць для паляпшэньня беларускае справы у Латвіі? Анкета*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 6(23), с. 353.

653 Н. Слука, *Часопісы беларускай эміграцыі ў Латвіі ў міжваенны перыяд (на аснове фондаў аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі)* [у:] *Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі*, Менск 2013, с. 191–192.

не захапіўся ў сваім жыцці якой-колечы высокай ідэяй, а жыве толькі для свайго ўласнага бруха, – не ёсць запраўдны чалавек, жыццё ягонае падобна да жыцця жывёлы: паеў, папіў, на паветры пасядзеў ды спаць лёг, а на другі дзень – пачынай спачатку! Гэтак жыць нельга! Трэба, каб была справа не толькі для бруха, але і для духа – для душы! Кожны беларус павінен жыць і працаваць не толькі для сябе, але і лепшае будучыні нашага народа"[654].

Рэдакцыя заахвочвала чытачоў падпісвацца на выданне. Напрыклад, сталыя падпісчыкі атрымлівалі дармавыя асобнікі выданняў К. Езавітава *Беларусы ў Літве*, *Беларусь у мінулым і сучасным* і інш. Нягледзячы на тое, што часопіс быў адрасаваны латвійскім беларусам, яго ведалі і за межамі Латвіі. Дзякуючы знаёмствам К. Езавітава, выданне трапляла ў Менск, Прагу, асяродкі беларускага руху ў іншых гарадах і краінах. Часопіс трымаў сувязь з заходнебеларускімі калегамі, у рэдакцыю пісалі настаўнікі, напрыклад, з Нясвіжа. Па адным асобніку часопіса рэдакцыя высылала ў Вільню і Варшаву[655].

Часопіс лічыўся непалітычным, але ўсё ж адлюстроўваў ідэйныя погляды тых, хто яго выдаваў. На змест уплывалі ўнутраныя канфліктаў паміж лідарамі латвійскіх беларусаў. Вакол перыёдыка гуртаваліся дзеячы, якія падзялялі погляды К. Езавітава, у апазіцыі да якога знаходзіліся "людзі У. Пігулеўскага". Часам даходзіла да непаразуменняў паміж двума лагерамі[656]. Выяўляліся і прасавецкія настроі галоўнага рэдактара. Яны давалі аб сабе ведаць нават у публікацыях, якія не тычыліся палітыкі. Напрыклад, у адрасаваным настаўнікам раздзеле *Метадалогія і практыка* змяшчаліся праграмы пачатковых школ БССР з тэмамі, прысвечанымі "кастрычніцкай рэвалюцыі" і Леніну[657].

Асноўнай крыніцай фінансавання часопіса з'яўляліся ахвяраванні і выручка ад падпіскі. Вядома, што прынамсі на выданне першых нумароў К. Езавітаў мог выдаткаваць сродкі, атрыманыя з савецкага боку. Аднак у цэлым перыёдык на працягу ўсяго свайго існавання "хварэў" на хранічную нястачу грошай. Праз гэта часопіс, які пазіцыянаваўся як штомесячнік, выдаваўся нерэгулярна і з перапынкамі. У 1926 г. выйшлі толькі два нумары,

---

654 *Браты-беларусы!,* "Беларуская школа ў Латвіі" 1927, № 6(4), с. 79.

655 НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 139, л. 5, 7.

656 Яскрава пацвярджае гэта сітуацыя, калі кіраўнік Беларускага школьнага аддзела звярнуўся да рэдакцыі з патрабаваннем зняпраўдзіць інфармацыю, якая з'явілася ў № 15–17 за 1932 г. Артыкул быў прысвечаны сходу Рады БША, падчас якога адбылася спрэчка паміж У. Пігулеўскім і К. Езавітавым. На думку першага, публікацыя ўтрымлівала шэраг памылак прадстаўляючы яго ў неадпаведным святле. Акрамя таго, У. Пігулеўскі падкрэсліў, што афіцыйна ён не запрашаў на сход прадстаўнікоў прэсы. LVVA, 2125 f., 5 apr., 13 l., 47 lp.

657 *Праца Станькаўскай школы 4-х годкі за 1-е паўгодзьдзе 1925–26 навуч. г.*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1927, № 3(1), с. 29–31.

у 1927 г. – пяць. Першы працяглы перапынак назіраўся з траўня 1927 па красавік 1928 г. Адсутнасць беларускага педагагічнага выдання адмоўна ўплывала на стан беларускіх школ. У сувязі з гэтым напрыканцы снежня 1927 г. кіраўніцтва ТБНЛ прыняло рашэнне ўзнавіць выданне часопіса. У № 1 за 1928 г. (красавік) рэдакцыя заклікала чытачоў падтрымаць выданне матэрыяльна і духова, дасылаць артыкулы і зацемкі, трымаць шчыльныя кантакты з рэдакцыяй. У адозве чытаем: "*Толькі актыўнае ўдзельнічанне ўсяго настаўніцтва ў нашай працы дасць магчымасць часопісу весці неспыняемую працу ў змаганні за беларускую школу і асвету ў Латвіі*"[658].

У 1928 і 1929 гг. удалося выдаць яшчэ па адным нумары, пасля чаго зноў адбыўся перапынак. На працягу 1930 і 1931 г. не выйшла ніводнага нумара часопіса. Толькі ў 1932 г. К. Езавітаў вярнуўся да выдання перыёдыка. 2 чэрвеня 1932 г. рэдакцыя абвясціла пра ўзнаўленне часопіса і звярнулася да грамадскасці з заклікам падтрымаць яго. У аздове падкрэслівалася, што ад колькасці атрыманай дапамогі будзе залежаць фармат і памер выдання. У разгляданы час часопіс выходзіў выключна дзякуючы ахвярнасці чытачоў, большасць якіх складалі настаўнікі беларускіх школ. Напрыклад, калектыў Рыжскай беларускай гімназіі ахвяраваў 10 латаў на кожны нумар. За гэта педагагічная рада гімназіі атрымлівала 10–20 асобнікаў, якія раздавалі найлепшым вучням. Рэдакцыя спадзявалася, што за прыкладам рыжан пойдуць іншыя беларускія школы[659]. Дзякуючы намаганням рэдакцыі і спонсараў, у 1932 г. пабачыла свет сем нумароў, што належыць лічыць своеасаблівым рэкордам у параўнанні з папярэднімі гадамі. На агульным сходзе ТБНЛ 28 траўня 1933 г. было вырашана звярнуцца да беларускай грамадскасці з просьбай падтрымаць грашова штомесячнік як "адзіную беларускую часопісь у Балтыі"[660].

У выданні часопіса дапамагаў Беларускі школьны аддзел, які пералічваў грошы па лініі ТБНЛ. З іншага боку, рэдакцыя была супраць таго, каб выданне моцна залежала ад БША: адносіны паміж бакамі не заўсёды былі беспраблемнымі. На пасяджэнні Рады Беларускага школьнага аддзела 20 чэрвеня 1932 г. яе кіраўнік заблакаваў прапанову М. Дзямідава выдаць юбілейны нумар штомесячніка "Беларуская школа ў Латвіі" замест спецыяльнага альманаха, прысвечанага школьнай справе беларускай меншасці[661].

Рэдакцыя ўвесь час заклікала суайчыннікаў не пакідаць выдання. У № 1 за 1933 г. выдаўцы роспачна прасілі чытачоў і грамадскасць падтрымаць часопіс,

---

[658] *Клічам наша грамадзянства напружыць сілы*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1927, № 8(1), с. 110.

[659] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 139, л. 1–2.

[660] *З жыцьця Т-ва Беларускіх вучыцялёу у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 4(21), с. 322.

[661] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 51 lp.

падкрэсліваючы, што ад фінансавай помачы залежыць выхад наступных нумароў[662]. У чарговым нумары рэдакцыя зноў заклікала сваіх прыхільнікаў ратаваць выданне, звяртаючы ўвагу на тое, што творчыя супрацоўнікі не атрымліваюць ганарару за працу, няма грошай на аплату тэхнічных работнікаў (набор, друк, клішэ і г. д.)[663]. Самаахвярнасці чытачоў і супрацоўнікаў часопіса, аднак, не хапіла на тое, каб выратаваць яго. У апошні год выдання, 1933 г., пабачылі свет яшчэ сем нумароў перыёдыка. Разам на працягу 1926–1933 г. выйшлі 24 нумары, большасць якіх прыпала на два апошнія гады існавання выдання.

Падсумоўваючы гісторыю часопіса "Беларуская школа ў Латвіі" належыць падкрэсліць, што быў ён, як і "Голас беларуса", найбольш доўгатэрміновым перыёдыкам латвійскіх беларусаў у міжваенны час. Выданні лучыла постаць заснавальніка і галоўнага рэдактара. Менавіта К. Езавітаў задаваў тон гэтым перыёдыкам і фарміраваў іх ідэйную лінію.

Апаненты К. Езавітава рабілі спробы стварыць супрацьвагу яго выданням. У чэрвені 1926 г. пачаў выходзіць **"Гаспадар. Месячнік вясковай гаспадаркі і кааперацыі".** У ролі выдаўца выступала Беларускае цэнтральнае ашчадна-пазыковае таварыства, а галоўным рэдактарам з'яўляўся Ян Шчорс. Сярод аўтараў можна ўзгадаць Яна Тэтара, Ніну Пінскую, Люцыю Клагіш і інш. Сядзіба рэдакцыі знаходзілася ў Рызе па адрасе: *Marijas iela 13,* пазней яна пераехала ў новае месца *Architektu iela 1.* Перыёдык друкаваўся ў друкарні Арта. Свае мэты рэдакцыя тлумачыла ва ўступным артыкуле, у якім чытаем: "*У наш век, век гуртавання людзей па нацыянальнасцях, партыях і хаўрусах жыць асобнымі адзінкамі немагчыма. Хоць гэта вядома са старадаўніх часоў, але, на жаль, не ўсім, і менш усяго беларусам. У той час, як іх суседзі, штурхаемыя варункамі жыцця, з даўніх часоў ужо мелі свае гурткі і пад назовам гільдый, цэхаў, арцеляў і г.д., беларусы капаліся ў шнурах свае зямліцы і не пазналі яшчэ моцы і неабходнасці аб'яднанняў для іх карысці. Настала аднак пара і нам, беларусам, калі жадаем мы палепшыць абставіны свайго жыцця, узяцца за розум і, па прыкладу другіх, выявіць сваю здольнасць гуртавацца, бо іначай без карысці для нас прападзе марна ўся наша працавітасць, і мы заўсёды будзем ісці ззаду за другімі і сваёю працаю будзем дапамагаць культурнаму і матэры'яльнаму ўзмацненню з'арганізаваных у гурткі, сяброўствы і кааператывы сваіх суседзяў. Выдаваемы месячнік і ставіць сваёю мэтаю высвятліць беларусам Латвіі карысць і неабходнасць у вяскова-гаспадарчым жыцці аб'яднанняў, дзеля чаго будзе змяшчаць на сваіх старонках весткі аб дасягненнях, зробленых*

---

[662] *Да нашых беларускіх чытачоў і ўсяго беларускага грамадзтва*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 1(18), с. 268.

[663] *Да нашых чытачоў і прыхільнікаў*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 2(9), с. 273.

гаспадарчымі аб'яднаннямі ў найпярэдніх краёх і Латвіі, будзе даваць адказы на скіраваныя да яго пытанні адносна аб'яднанняў і не адмовіць у месцы на шпальтах месячніка карысным прапановам чытачоў у названым кірунку"[664].

Газета выходзіла на васьмі старонках, асвятляючы розныя аспекты беларускага жыцця. Першая старонка ўтрымлівала характэрную выяву селяніна-аратага на фоне хаты, поля і заходзячага сонца, што побач з назвай павінна было сведчыць пра сельскагаспадарчы профіль выдання. Аднак газета не абмяжоўвалася справамі сельскай гаспадаркі і кааперацыі. У ёй друкаваўся вяскова-гаспадарчы каляндар, хроніка грамадскай актыўнасці беларускай меншасці (*Грамадзкае жыццё*), матэрыялы пра кааперацыю і вядзенне сялянскай гаспадаркі (*Тое-сёе з гаспадарчага жыцця*), зацемкі пра дзейнасць БЦПАТ (*Паведамленні Беларускага цэнтральнага пазыкова-ашчаднага т-ва ў Латвіі*), адказы на лісты чытачоў у рэдакцыю (*Паштовы куток*). Газета ўтрымлівалася за кошт ахвяраванняў і падпіскі. Арганізацыяй апошняй у правінцыі займаліся: кс. Язэп Гайлевіч – у Індры, настаўнікі Еўдакім Красцьянцаў – у Пасіене, Часлаў Клагіш – у Пустыні і Кастусь Дубавік – на Прыдруйшчыне[665]. Выданне пашыралася сярод сяброў БЦПАТ і актывістаў іншых беларускіх арганізацый. Пры гэтым першыя атрымлівалі выданне бясплатна. У адным з нумароў рэдакцыя заклікала чытачоў аплаціць атрыманыя асобнікі, што магло сведчыць пра кепскую арганізацыю распаўсюду. Рэдакцыя падтрымлівала кантакты з заходнебеларускімі выданнямі правага ўхілу: органам Беларускага сялянскага саюза "Сялянская ніва" і органам Беларускай цэнтральнай рады "Беларускае слова". Выдаўцы супрацоўнічалі таксама з ковенскім часопісам "Крывіч". Нягледзячы на шматабяцальны пачатак, газета скора спыніла існаванне. Верагодна, прычынай скону выдання была адсутнасць сродкаў. Цягам 1926 г. пабачылі свет толькі чатыры нумары.

Няўдачу "Гаспадара" часткова кампенсавала выданне **"Школьная праца"**, якое пачало выходзіць у 1926 г. Гэта быў часопіс настаўнікаў і вучняў Даўгаўпілскай беларускай гімназіі, а яго галоўным рэдактарам і адказным за выданне з'яўляўся дырэктар С. Сахараў. У падрыхтоўцы нумароў бралі ўдзел вучні розных класаў, у тым ліку – Язэп Клагіш, Кацярына Тыран, Уладзімір Меншыкаў, Карл Казакевіч, Дзмітрый Сахараў, Мікола Панькоў, Я. Дамброўскі, Яўген Бартуль, Я. Кляменцьева, Пётр Кайраў, Браніслаў Юрэвіч, А. Маслоўскі, П. Лебядок, А. Чарткевіч, Сцяпан Шаўцоў, М. Рацын і інш. Выхаванцы гімназіі (Пятро Мірановіч, Міхась Калінін, Мікола Трубяцкі) сваімі малюнкамі аздаблялі вокладкі выдання, перапісвалі

---

[664] *Аб'еднаньнем памагайце сабе самі*, "Гаспадар" 1926, № 1, с. 2.

[665] *Паведамленьня Беларускага Цэнтральнага Пазычкова-Зьберагальнага Т-ва у Латвіі*, "Гаспадар" 1926, № 3, с. 24.

і друкавалі нумары, збіралі і апрацоўвалі дасланы матэрыял. Аўтарамі часопіса былі як настаўнікі, так і вучні і выпускнікі гімназіі. Згодна з задумай выдаўцоў, перыёдык меўся выходзіць штомесяц за выключэннем ліпеня і жніўня, калі ў гімназіі былі вакацыі. Аднак на практыцы часопіс выдаваўся нерэгулярна. Напрыклад, у 1928 г. выйшаў толькі адзін нумар. На часопіс можна было падпісацца, да чаго ўвесь час заахвочвала чытачоў рэдакцыя. Наклад выдання складаў ад 150 да 250 асобнікаў.

Часопіс не быў друкаваны, а пісаўся ад рукі. Дадзеная акалічнасць сведчыла пра абмежаваныя фінансавыя магчымасці выдаўцоў. Часопіс пачаў выходзіў у складаны час, калі ў паветры вісеў цень беларускага працэсу. Гэта адчувалася ў першых нумарах выдання. Кожны з іх утрымліваў хроніку падзей (рубрыка *Летапіс гімназіі*), якія адбываліся ў мурах гімназіі. Пачынаючы з № 2 часопіс меў рубрыку *Думкі беларускага вучыцеля*, у якой змяшчаліся матэрыялы, прысвечаныя школьнай справе. З нагоды 5-годдзя існавання гімназіі № 6 (лістапад-снежань 1926 г.) апублікаваў кароткі нарыс гісторыі гэтай установы, які падрыхтаваў С. Сахараў[666]. У сувязі са святкаваннем юбілею рэдакцыя заклікала настаўнікаў і вучняў дасылаць свае матэрыялы пра "альма матар". У 1926 г. на старонках выдання з'явіўся артыкул настаўніка, які заклікаў беларускую грамадскасць адзначыць 5-годдзе існавання беларускай школьнай справы ў Латвіі. Ён прапаноўваў зладзіць у Рызе, Даўгаўпілсе і Лудзы публічныя мерапрыемствы (лекцыі, рэфераты) і пачаць выданне ўласнага альманаха[667].

Нярэдка на старонках часопіса публікаваліся вучнёўскія вершы. У рубрыцы *Бібліяграфічныя заметкі* змяшчаліся кароткія анатацыі, прысвечаныя новым выданням, у тым ліку – заходнебеларускім. Існаваў раздзел з хронікай беларускага жыцця па-за межамі Латвіі. Пачынаючы з № 12 (люты-сакавік 1929 г.) прыярытэтам выдання стала публікацыя вуснай народнай творчасці латгальскіх беларусаў. Рэдакцыя заклікала беларускае настаўніцтва і грамадскасць збіраць і дасылаць фальклор. Гэта адбылося пад уплывам палявых экскурсій гімназістаў па вёсках Латгаліі і Ілукшчыны, у выніку якіх быў назапашаны багаты этнаграфічны матэрыял. З іншага боку, такія публікацыі мелі быць адказам на словы тых, хто аспрэчваў існаванне беларусаў у Латгаліі і іх самабытнай культуры[668]. Галоўны рэдактар адзначаў, што ў Латагаліі беларусы захавалі адметную і ўласцівую толькі ім беларускую культуру, таму нельга дапусціць, каб гэты духоўны скарб быў страчаны.

---

[666] С. Сахараў, *Да гісторыі Дзьвінскай беларускай дзяржаўнай гімназіі (Кароткі нарыс за 1922–1927 гг.)*, "Школьная праца" 1926, № 6, с. 18–23.

[667] Беларускі вучыцель, *Да пяцігадовага юбілея беларускай школы ў Латвіі (1921–1926)*, "Школьная праца" 1926, № 2, с. 20.

[668] *Ад рэдакцыі*, "Школьная праца" 1929, № 12, с. 1–4.

Ён пераконваў, што латвійскія студэнты-этнографы, якія не ведаюць добра беларускай мовы і яе фанетыкі, падчас запісу робяць памылкі. Таму менавіта беларусы павінны рупіцца пра захаванне і апрацоўку сваёй народнай творчасці[669]. У выданні былі таксама рубрыкі *Думкі настаўніка* і *Думкі аб школе*, у якіх аўтары закраналі актуальныя і набалелыя пытанні, звязаныя са школьнай працай, абмяркоўвалі праблемы і шукалі шляхі іх вырашэння. У № 10 за 1928 г. рэдакцыя звярталася да моладзі: "*Гартуйце ж душы вашы, каб халодны сівер іх не замарозіў, каб вечна яны засталіся маладымі і ніякая сіла не здолее разбіць у іх моцнае жаданне працаваць і працаваць для святой ідэі адраджэння многапакутнага, але багатага духоўнымі талентамі беларускага народа*"[670].

Рэдакцыя заклікала суродзічаў аддаваць дзетак у родную школу. ¾ матэрыялу на старонках выдання выйшла з-пад пяра вучняў, і толькі часамі прысутнічалі "перадавіцы" аўтарства педагогаў. Гэта была свядомая і мэтаскіраваня палітыка выдаўцоў, якая, на іх думку, спрыяла творчаму супрацоўніцтву вучняў і настаўнікаў, а таксама выхоўвала самастойнасць у першых[671]. На старонках выдання асвятлялася не толькі жыццё гімназіі, але і грамадска-культурны рух на Даўгаўпілшчыне і Лудзеншчыне. Публікаваліся таксама звесткі пра выданні замежных беларусаў.

Рэдакцыя "Школьнай працы" намагалася выхоўваць моладзь у патрыятычным духу. Тэксты поўніліся патрыятычнымі матывамі. Аўтары заклікалі вучняў падчас вакацый у родных мясцінах гутарыць з сялянамі пра беларускі народ, яго мову і культуру: "*Вось ты, хлопец ці дзяўчына, хутка паедзеш з гімназіі на вёску да сваіх бацькоў, паедзеш з гімназіі на адпачынак і каб ім дапамагчы ў іх цяжкай вясковай працы – раскажы ім, што ты вучыў і што чуў аб беларускім народзе, аб яго долі, аб яго жыцці і яго надзеях і імкненнях. Паедзеш ты ў нядзелю ў царкву ці касцёл і там сустрэнеш сваіх знаёмых: завядзі з імі гутаркі аб нашым адраджэнні, аб нашым нацыянальным руху, аб сучасным становішчы нашага народа; у Радавай Беларусі, у Польшчы, аб нашым жыцці ў Латвіі, аб тым як трэба шанаваць сваю мову, культуру, захоўваць сваю школу і вучыць усіх сваіх дзетак і чаму трэба заўсёды выяўляць свой беларускі твар і ніколі не адракацца ад свайго роднага. Заклічуць цябе на вечарыну ці вяселле: ідзі туды ў нацыянальнай вопратцы і трымай сябе добра; скачы ў першую чаргу свае нацыянальныя скокі, зацягні сваю родную песню, прадэкламуй знаёмым беларускі верш. Сядзіш дзе-небудзь у вольны час па прызбе і збяруцца навокал цябе сяляне: прачытай ім беларускую газету, арганізуй сярод іх падпіску на беларускую*

---

669 С. Сахараў, *Латгалія і беларусы*, "Школьная праца" 1929, № 13, с. 1–4.

670 *Навагоднія думкі (зварот да моладзі)*, "Школьная праца" 1928, № 10, с. 2.

671 *Ад рэдакцыі*, "Школьная праца" 1927, № 7, с. 20.

часопісь, растлумач ім карысць удзелу ў беларускіх арганізацыях і г.д."[672]. На старонках выдання У. Пігулеўскі перасцерагаў моладзь, каб яна пасля заканчэння школы "*не ўцякла ў чужыя таборы*", паколькі "*акружаючы свет падаецца занадта прыгожым, прывольным і багатым у параўнанні з непрыгляднасцю і беднасцю беларускага жыцця, і для таго, каб гэта прыгажосць не знадзіла чалавека, не спакусіла яго адвярнуцца ад роднае халупкі, патрэбна скаваць у душы крэпкія, нерастыржаныя ідэёвыя скрэпы*"[673].

Нягледзячы на сціплы выгляд і магчымасці, часопіс "Школьная праца" рабіў добрае ўражанне на чытачоў не толькі ў Латвіі, але і па-за яе межамі. Напрыклад, заходнебеларускае выданне "Наша праўда" (№ 10 ад 7 траўня 1927 г.) не шкадавала пахвал на адрас даўгаўпілскага перыёдыка. Гэтае захапленне, аднак, не падзяляў К. Езавітаў, які на старонках "Голасу беларуса" крытыкаваў выдаўцоў "Школьнай працы", дакараючы іх за "нячыстую мову" (русізмы), кепскую якасць малюнкаў і празмерную колькасць вучнёўскіх тэкстаў. З гэтымі заўвагамі рэдакцыя часопіса не пагаджалася[674].

Часопіс сутыкаўся з фінансавымі цяжкасцямі. Кіраўніцтва гімназіі звярталася ў Культуры фонд Латвіі з просьбай дафінансаваць выданне ў памеры 500 латаў. Просьба была адхілена з абгрунтаваннем, што "падобныя часопісы выдаюцца сіламі і коштам саміх гімназій і не з'яўляюцца якой-колечы бібліяграфічнай вартасцю, выданне якіх вымагала б дапамогі". Адначасова Культуры фонд Латвіі адмовіўся дафінансаваць выданне гістарычнага альманаха гімназіі матывуючы гэта тым, што школа ўжо атрымала сродкі, якімі можа распараджацца паводле сваіх патрэб[675]. Матэрыяльныя цяжкасці не дазволілі "Школьнай працы" доўга праіснаваць. Апошні нумар часопіса выйшаў у 1930 г. Разам за перыяд 1926–1930 гг. свет пабачылі 14 нумароў.

Акрамя "Школьнай працы" ў мурах гімназіі ўзнікалі рукапісныя выданні **"Альманах", "Шлях з цьмы", "Пралеска", "Зорка", "Наш шлях з цьмы"**. На іх бачынах публікаваліся літаратурныя творы вучняў. Падрабязнейшых звестак пра гэтыя часопісы не захаваліся, найхутчэй, выдаваліся яны эпізадычна[676].

Напрыканцы 1920-х гг. у Латвіі не з'явілася новых беларускіх перыёдыкаў. Выключэнне складалі дзве аднаднёўкі – – **"Праца"** і **"Шлях праўды"**. (Першая з іх выйшла 29 чэрвеня 1928 г. у Даўгаўпілсе, другая неўзабаве – у Рызе.) Адказным рэдактарам "Шляху праўды" быў Франц Клагіш, а ў якасці

---

[672] *Нашай моладзі*, "Школьная праца" 1929, № 13, с. 21.

[673] У. Пігулеўскі, *Моладзі*, "Школьная праца" 1927, № 8–9, с. 3.

[674] *Беларускае жыцьцё у Латвіі*, "Голас беларуса" 1927, № 7 ад 6 красавіка, с. 4; *Ад рэдакцыі*, "Школьная праца" 1927, № 7, с. 20.

[675] LVVA, 2067 f., 1 ap., 386 l., lp. 21.

[676] М. Ліс, *Педагагічная і культурна-асветніцкая дзейнасць С.П. Сахарава*, "Весці Акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук" 1995, № 3, с. 103–104.

выдаўца выступілі Даўгаўпілскі і Лудзенскі аддзелы ТБНЛ. Прычынай з'яўлення абедзвюх 4-старонкавых аднаднёвак была грамадска-палітычная сітуацыя (парламенцкія выбары), пра што будзе гаворка ў іншым раздзеле манаграфіі.

Заслугоўвае ўвагі факт, што ў 1930 г., падчас перапынку ў выданні часопіса "Беларуская школа ў Латвіі", у Рызе выйшаў адзін нумар выдання **"Школа і жыццё"**. Галоўным рэдактарам перыёдыка быў М. Дзямідаў, які тады займаў пасаду старшыні Таварыства беларускіх настаўнікаў у Латвіі. Выданне друкавалася ў тыпаграфіі па адрасе: *Ģertrūdes iela 80*, а рэдакцыя месцілася на *Tumes iela 2*[677]. З'яўленне часопіса належыць лічыць спробай перахапіць з рук К. Езавітава ініцыятыву выдання друкаванага органа ТБНЛ. Невыпадкова, што новае выданне было задумана як працяг часопіса "Беларуская школа ў Латвіі" і мела аналагічную скіраванасць. Змест складалі матэрыялы, прысвечаныя адукацыі. Акрамя педагагічных (*Прынцыпы працоўнае школы*, *Аб прафэсыянальных школах*, *Хроніка*), часопіс утрымліваў артыкулы гістарычныя (*Статут В. Кн. Літоўскага на фоне эволюцыі соцыяльных адносінаў у Беларусі*, *Археэолёгічны Інстытут на Беларусі*), палітычныя (*Беларускае пытаньне ў Латвійскім парлямэнце*) і культурныя (*Справаздача аб чыннасьці Беларускага Асьветнага Таварыства "Беларуская хата"*, *Дні Беларускае Культуры*)[678]. Аднак гэтай выдавецкай ініцыятыве не было наканавана доўгае жыццё. У выніку першы нумар аказаўся апошнім.

З'яўленне чарговага перыёдыка было звязана з дзейнасцю Таварыства беларускай моладзі ў Латвіі. У 1930 г. у Рызе выйшаў першы нумар грамадска-навукова-літаратурнага часопіса **"Пагоня"**. Перыёдык пазіцыянаваў сябе як "беларускі грамадска-навуковы і літаратуры журнал". Галоўным рэдактарам лічылася Ніна Пінская, але асобай, адказнай за падрыхтоўку выдання, быў Пятро Журкоўскі. Пяру апошняга належала частка публікацый. Апроч яго на старонках выдання друкаваліся Н. Пінская, Я. Кастылюк, В. Вальтар. Перыёдык быў разлічаны на маладое пакаленне. Дзеячы ТБМЛ намагаліся з дапамогай часопіса пашыраць пачуццё нацыянальнай свядомасці. У звароце рэдакцыі адзначалася: "*Пры самых рожнаадменных поглядах на рэчы, у самыя гарачыя моманты палітычнае і грамадскае нязгоды нельга забывацца, што ўсе мы перш за ўсё беларусы, дзеці аднае зямлі, аднае маці, аб існаванні якой мы не маемо права забывацца і знявага якой ёсць ганьбай. Мы лічымо,*

---

[677] M. Jankowiak, *Prasa białoruska międzywojennej Łotwy (przegląd wydawnictw)*, "Studia Białorutenistyce" 2021, t. 15, s. 23.

[678] Н. Слука, *Часопісы беларускай эміграцыі ў Латвіі ў міжваенны перыяд (на аснове фондаў аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі)* [у:] *Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі*, Менск 2013, с. 189–195.

што поўная свядомасць нацыянальная ёсць першае аружжа, з якім трэба выходзіць на прасторы грамадскага жыцця; гэта ёсць духовая моц, той магутны рычаг, які перамагае ўсё. Дык паспрабуймо ж зноў знайсці адзіную мову, якую разумелі б усе і кожны з нас, паспрабуймо зноў супольна гараць нашы родныя адлогі і сеяць моцнае найсвяцейшае зерне – вялікае пачуццё багавення і кахання да свае нацыі!"[679]. На старонках выдання можна трапіць на жыццяпіс Івана Луцкевіча, а таксама беларускія народныя творы. Акрамя публікацый патрыятычнага характару друкаваліся літаратурныя творы і хроніка дзейнасці ТБМЛ. Шмат увагі надавалася беларускім школам[680]. Слабым месцам выдання з'яўляўся яго выгляд, які сведчыў пра сціплыя фінансавыя магчымасці выдаўцоў. Верагодна, з гэтае прычыны перыёдык нядоўга праіснаваў. Звестак пра выданне часопіса ў 1931 г. не захавалася.

Пазней ТБМЛ вярталася да ідэі выдання ўласнага друкавана органа. 21 ліпеня 1932 г. выйшаў першы нумар бюлетэня ТБМЛ **"Апавесьнік"**, які быў набраны на друкарцы. Выдавецкі калектыў складаўся з Пятра Масальскага (старшыня цэнтральнай управы), Веры Бялінскай (скарбнік) і Язэпа Каялы (сактатар). На жаль, не захаваўся ніводзін асобнік. З іншых крыніц вынікае, што змест выдання быў прысвечаны дзейнасці ТБМЛ і яго кіроўных органаў. У гэты час таварыства перажывала крызіс, выкліканы дзейнасцю папярэдняга складу цэнтральнай управы – рэвізійная камісія мела да яго прэтэнзіі, што знайшло адлюстраванне на старонках бюлетэня[681].

Калі "Голас беларуса" спыніў выхад, беларусам Латвіі не ставала шматфарматнага грамадска-палітычнага перыёдыка. Гэты прагал спрабавалі запоўніць выданні, які з'яўляліся на пачатку 1930-х гг. У студзень 1930 г. у Даўгаўпілсе пачала выходзіць газета **"Наша доля"**. Рэдактарам выдання стаў Уладзімір Відаўскі, а выдаўцом – Беларускае культурна-асветнае таварыства "Прасвета". Сядзіба рэдакцыі знаходзілася па адрасе: *Skrindas iela 13*, а газета друкавалася ў гарадской тыпаграфіі (*Zaļā iela 8*)[682]. На старонках выдання пераважала грамадска-палітычная тэматыка. Да стварэння новага перыёдыка падштурхнуў чарговы перапіс насельніцтва. Беларускі актыў разумеў, як моцна ад друкаванага слова залежыць нацыянальнае самавызначэнне латгальскай вёскі. Напярэдадні перапісу рэдакцыя бачыла патрэбу кансалідацыі беларускага актыву і пераадолення ўнутраных супярэчнасцей. У № 1 перыёдыка (26 студзеня 1930 г.) чытаем: "*Цяпер, калі ў звязку*

---

[679] *Ад рэдакцыі*, "Пагоня" 1930, № 1, с. 2.

[680] M. Jankowiak, *Prasa białoruska międzywojennej Łotwy (przegląd wydawnictw)*, "Studia Białorutenistyce" 2021, t. 15, s. 24.

[681] *Хроніка беларускага жыцьця ў Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 4(14), с. 209.

[682] M. Jankowiak, *Prasa białoruska międzywojennej Łotwy (przegląd wydawnictw)*, "Studia Białorutenistyce" 2021, t. 15, s. 22.

з агульналатвійскім народным перапісам беларуская меншасць у Латвіі перажывае крызіс як звонку так і ўнутры, асабліва востра адчуваецца важнасць аб'яднання і арганізавання ўсіх беларусаў, стаячых на грунце дэмакратызму. Аб гэтым гавораць цяпер усе, але ў большасці выпадкаў няма акрэсленага ўяўлення аб тым, з чаго пачаць і як весці гэтую справу аб'яднання. Можна ў розны спосаб уяўляць сабе будучыню гэтага аб'яднання, але перш за ўсё патрэбна, абавязкова патрэбна стварыць фактычную звязь між беларускімі цэнтрамі, асабліва вёскамі, на рэгулярнай агульнай рабоце, бо самая раздробленасць прыгнечывае людзей, якія 'сядзяць як у яме', не ведаючы, што дзеецца, на белым свеце, у каго ім навучыцца, як здабыць сабе вопыт, як задаволіць жаданне шырокай дзейнасці. І гэтую фактычную звязь можна пачаць тварыць толькі на агульнай беларускай газеце, суміруючы ітогі самых розных відаў дзейнасці і тым пабуджаючай людзей ісці няўтомна ўперад. Кожнай беларускай арганізацыі, кожнаму паасобнаму беларусу, гэтая газета пакажа на мясцох агульны абрыс, памеры і характар агульнае справы, пакажа, якія прабелы мацней за ўсё адчуваюцца ў сваёй агульнабеларускай дзейнасці, дзе слабыя звязі, якія калёсікі агульнага механізму магла б даная арганізацыя падправіць альбо замяніць лепшымі"[683].

На старонках выдання друкаваліся, між іншым, С. Сахараў і Я. Кастылюк. Акрамя таго, з выданнем супрацоўнічалі інспектар беларускіх школ і кіраўнік БША. Апошні інфармаваў чытачоў пра сваю працу ў Сойме. Газета друкавала міжнародны палітычны агляд (*З усяго сьвету*). Выдаўцы цікавіліся жыццём у БССР, да якой ставіліся стрымана. У прыватнасці, друкаваліся крытычныя артыкулы пра калектывізацыю і змены ў нацыянальнай палітыцы[684]. Аўтар артыкула *Праўда пераможа*, аналізуючы становішча беларускай справы, сцвярджаў, што найгорш беларусам "пад Польшчай", тым часам, як беларускае пытанне вырашаецца на ўсходзе, дзе ў складзе СССР існуе БССР, у якой гучыць родная мова, працуе асвета і навука. Разам з тым, ён адзначаў, што "*Радавая ўлада яшчэ ня здзейсніла ўсіх правідловых дамаганняў беларускага працоўнага народа, бо да гэтага часу яна не далучыла да радавай Беларусі ўсходнія часткі беларускай зямлі з 3-х мільённым жыхарствам*"[685]. У выданні друкавалася хроніка беларускага жыцця ў Латвіі і ў іншых краінах. Ад трэцяга нумара апошнюю старонку займала рубрыка *Аддзел Аратая* дзе даваліся практычныя парады таварыства "Араты"для сялян. Рэдакцыя супрацоўнічала з заходнебеларускай хадэцкай прэсай, пра

---

[683] *Нашыя задачы*, "Наша доля" 1930. № 1 ад 26 студзеня, с. 1.

[684] *Сялянская эміграцыя з Сав. Беларусі*, "Наша доля" 1930. № 3 ад 8 сакавіка, с. 1; Лад, *Паварот ці перадышка?* "Наша доля" 1930. № 4 ад 8 красавіка, с. 2.

[685] Стары беларус, *Праўда пераможа (25 III. 1918 г.–25 III. 1930 г.)*, "Наша доля" 1930, № 4 ад 8 красавіка, с. 2.

што сведчыць пазітыўная згадка пра выданне даўгаўпілсцаў на старонках віленскай "Беларускай крыніцы"[686].

Нягледзячы на шматабяцальны пачатак, "Наша доля" скора спыніла існаванне. Ёсць падставы меркаваць, што галоўнай прычынай з'яўлялася адсутнасць сродкаў на выданне. Усе чатыры нумары газеты пабачылі свет у 1930 г.

Своеасаблівым яе працягам з'яўлялася газета **"Думка беларуса"**, першы нумар якой выйшаў у Даўгаўпілсе ў ліпені 1931 г. Новае выданне, якое лічылася друкаваным органам навастворанай Беларускай дэмакратычнай партыі ў Латвіі, рэдагаваў Я. Якубоўскі. Рэдакцыя знаходзілася па адрасе: *Viļņas iela 23/5, a* друкавалася газета ў вядомай ужо даўгаўпілскім беларусам тыпаграфіі па адрасе: *Zaļā iela 8*[687]. Паводле задумы рэдакцыі, 4-старонкавы перыёдык павінен быў выходзіць два разы на месяц: 1-га і 15-га дня. Ва ўступным артыкуле выдаўцы заклікалі беларусаў яднацца вакол новай газеты і падтрымаць як выхад: "*Чужымі газетамі разбурваецца і паступова засарваецца наша нацыянальнае пачуццё, зневажаючы нашы інтарэсы і сумныя вынікі гэтага мы ўжо бачым. У першую чаргу мы бачым, што беларусы, нягледзячы на іх малую лічбу, параскідаліся па розных кірунках і чужых партыях. Па-другое, кожны скарыстоўвае беларуса толькі для сваіх асабістых інтарэсаў, асабліва ў перадвыбарчыя часы. Кожнаму патрэбны толькі беларускія галасы, а калі нада бараніць запраўдныя інтарэсы беларускай нацыянальнай меншасці, дык некаму. Такі наш сучасны стан. Таму Беларуская дэмакратычная партыя, у мэтах аб'яднання беларускага жыхарства і накіравання яго па сваім родным шляху, паставіла аднэй з сваіх галоўных задач мець сваю беларускую часопісь у Латвіі, якая даходзіла б да кожнай беларускай сялянскай хаты (...) Большасць беларусаў прызвычаілася атрымліваць беларускія газеты дарма. І часта-густа так бывае, што за чужую газету мы з прыемнасцю плацім грошы, а за сваю шкадуем заплаціць 12 сант. Па разрахубе рэдакцыі, калі сярод беларусаў знайшлося б 1000 платных падпісчыкаў, дык гэта зусім забяспечыла б выхад нашай газеты два разы ў месяц. І мы думаем, няўжо ж з 36 тысяч беларусаў Латвіі не знойдзецца 1000 свядомых беларусаў, якія-бы ўняслі 3 л. 50 с. за год ці ў месяц 0,30 сант.? Спадзяваемся, што знойдзецца. Другі важны бок для існавання газеты –гэта сувязь з чытачамі. І мы заклікаем тут: пішыце, беларусы, хто як умее аб Вашым жыцці, аб Вашых патрэбах і мы па магчымасці ўсё будземо змяшчаць на шпальтах сваёй газеты (...) Беларусы! Чытайце і падтрымоўвайце сваю часопісь 'Думка беларуса'*"[688].

---

[686] *Беларусы пад Латвіяй*, "Беларуская крыніца", 1920, № 5 ад 9 лютага, с. 3.

[687] M. Jankowiak, *Prasa białoruska międzywojennej Łotwy (przegląd wydawnictw)*, "Studia Białorutenistyce" 2021, t. 15, s. 25.

[688] *Ад Рэдакцыі*, "Думка беларуса" 1931, № 1, с. 1.

Аўтарства публікацый на старонках газеты належала Я. Якубоўскаму, С. Сахараву і інш. У газеце друкаваліся матэрыялы пра грамадска-палітычную сітуацыю ў Латвіі, праблемы мясцовага беларускага сялянства і культурна-асветную працу ў яго асяроддзі. Нягледзячы на невялікі аб'ём (4 старонкі), газета была змястоўная і насычаная разнастайнай інфармацыяй не толькі пра дзейнасць партыі, але і пра беларускае жыццё ў Латвіі. Аўтары заахвочвалі бацькоў-беларусаў пасылаць дзяцей у беларускія школы, пісалі, як шкодна вучыць беларускіх дзетак у чужых школах. Намагаліся давесці сялянам, што яны грамадзяне дэмакратычнай дзяржавы, і іх будучыня знаходзіцца ў іх уласных руках[689]. Аўтары "Думкі беларуса" выступалі за беларусізацыю рэлігійнага жыцця – за тое, каб у касцёлах былі казанні па-беларуску[690].

"Думка беларуса" была запачаткаваная з думкай пра падрыхтоўку да парламенцкіх выбараў восені 1931 г. Аднак газета не здолела замацавацца на медыйным полі і ў выніку падзяліла лёс папярэднікаў. Разам – ад ліпеня да верасня 1931 г. – выйшлі пяць нумароў. Газету можна лічыць чарговай ахвярай хранічнага безграшоўя латвійскіх беларусаў.

Апошняй спробай выдання грамадска-палітычнага перыёдыка беларускай меншасці ў міжваеннай Латвіі можна лічыць з'яўленне газеты **"Беларускае слова"**. Выданне пазіцыянавала сябе як "палітычная, грамадская і літаратурная газета", а яе галоўным рэдактарам быў Пятро Журкоўскі. Сядзіба рэдакцыі знаходзілася ў Рызе па адрасе: *Nometņu iela 33*. Газета выходзіла на чатырох старонках. Матывы з'яўлення газеты належыць шукаць у падрыхтоўцы яе рэдактара да парламенцкіх выбараў. Перадвыбарчая праблематыка займала дамінантнае месца на старонках выдання, а другі нумар быў цалкам прысвечаны выбарчай агітацыі. Пятро Журкоўскі балатаваўся ў парламент як сябра Латгальскай хрысціянска-сацыяльнай партыі (гл. наступны раздзел). І менавіта гэтая партыя з'яўлялася галоўным фундатарам выдання. Таксама газета друкавала матэрыялы, якія тычыліся іншых аспектаў жыцця латвійскіх беларусаў, перадрукоўвала матэрыялы з іншых выданняў. У прыватнасці, на старонках "Беларускага слова" можна натрапіць на перадрукі з пражскага выдання "Іскры Скарыны" (артыкул Тамаша Грыба *Культурнае будаўніцтва Новае Беларусі*, у якім аўтар дзяліўся думкамі наконт культурных пераўтварэнняў у БССР)[691]. Быўшы праваканцерватыўным выданнем "Беларускае слова" займала непрыхільную пазіцыю ў дачыненні да камунізму

---

689 Дземенскі, *Беларусы, пасылайце сваіх дзетак толькі ў родныя беларускія школы*, "Думка беларуса" 1931, № 3, с. 3–4.

690 *"Кашачыя канцэрты" у касьцёлах Ілукшчыны*, "Думка беларуса" 1931, № 2, с. 3; *В. Пустынь*, "Думка беларуса" 1931, № 2, с. 3.

691 Т. Грыб, *Культурнае будаўніцтва Новае Беларусі*, "Беларускае слова" 1931, № 1, с. 2.

і СССР. На старонках выдання з'яўляліся зацемкі пра бальшавіцкі тэрор і рэпрэсіі, а таксама пра палітыку русіфікацыі ў Савецкай Беларусі. Акрамя таго, даваўся агляд беларускага жыцця ў Латвіі і іншых краінах (Польшча, Чэхаславакія). Выданне не здабыло шырокага водгуку ў беларускіх мас і скора перастала выходзіць. Пабачылі свет толькі два нумары (10 жніўня і 25 верасня 1931 г.). Газета выявілася кароткачасовым праектам на патрэбы канкрэтнай палітычнай кампаніі – выбараў.

Табліца 32. Беларускія газеты і часопісы ў Латвіі

Назва	Гады выдання	Месца выдання	Галоўны рэдактар / выдавец	Выдавец	Колькасць нумароў
"На чужыне": літаратура-грамадскі штомесячнік	1920	Рыга	Рыгор Казячы	Рыжскі аддзел Беларускага культурна-асветнага таварыства "Бацькаўшчына"	1
"Ластаўка": вучнёўскі часопіс Люцынскай беларускай гімназіі ў Латвіі	1923–1924	Лудза		Выдавецкая секцыя вучнёўскага гуртка Лудзенскай беларускай гімназіі	9
"Пачатковец"	1923	Даўгаўпілс		Беларуская пачатковая школа	2
"Моладзь"	1925	Даўгаўпілс		Даўгаўпілская беларуская гімназія (?)	1
"Голас беларуса": сялянска-работніцкая штотыднёвая газета	1925–1930	Рыга	К. Езавітаў		61
"Беларуская школа ў Латвіі": педагагічны штомесячнік; з № 6 (1927) педагагічна-грамадскі штомесячнік беларускае нацыянальнае меншасці ў Латвіі; № 1 (1928): часопіс таварыства беларускіх вучылялёў; № 7 (1932)-№ 2 (1933): папулярна-навуковы, педагагічны і літаратурна-грамадскі штомесячнік.	1926–1933	Рыга	К. Езавітаў	З красавіка 1928 г. – Таварыства беларускіх настаўнікаў у Латвіі	24

Назва	Гады выдання	Месца выдання	Галоўны рэдактар / выдавец	Выдавец	Колькасць нумароў
“Гаспадар”: месячнік вясковай гаспадаркі і кааперацыі	1926	Рыга	Я. Шчорс	Беларускае цэнтральнае пазыкова-ашчаднае таварыства ў Латвіі	4
“Школьная праца”: часопісь дзвінскай беларускай дзяржаўнай гімназіі	1926–1930	Даўгаўпілс	С. Сахараў	Даўгаўпілская беларуская гімназія	14
“Праўда”	1928	Даўгаўпілс			1 (аднаднёўка)
“Шлях праўды”: беларуская аднаднёўка	1930	Рыга	Ф. Клагіш	Даўгаўпілскі і Лудзенскі аддзелы ТБНЛ	1 (аднаднёўка)
“Школа і жыццё”: беларускі літаратурна-грамадскі і педагагічны штомесячнік Таварыства беларускіх вучыцялёў у Латвіі	1930	Рыга	М. Дзямідаў	Таварыства беларускіх настаўнікаў у Латвіі	1
“Пагоня”: Беларускі грамадска-навукова-літаратурны журнал	1930–1931	Рыга	Н. Пінская	Таварыства беларускай моладзі ў Латвіі	1
“Наша доля”: орган беларускай дэмакратычнай думкі ў Латвіі	1930	Даўгаўпілс	У. Відаўскі		4
“Думка беларуса”: часопісь Беларускае дэмакратычнае партыі ў Латвіі	1931	Даўгаўпілс	Я. Якубоўскі	Беларуская дэмакратычная партыя	5
“Беларускае слова”: палітычная грамадская і літаратурная газета	1931	Рыга	П. Журкоўскі	П. Журкоўскі	2
“Апавеснік”	1932	Рыга		Таварыства беларускай моладзі ў Латвіі	1

Крыніца: Jankowiak Mirosław, *Prasa białoruska międzywojennej Łotwy (przegląd wydawnictw)*, “Studia Białorutenistyce” 2021, t. 15, s. 28–29; уласныя падлікі аўтара.

Апрача вышэйзгаданых перыёдыкаў варта згадаць пра няздзейсненыя праекты латвійскіх беларусаў. У зборах Людмілы Краскоўскай захоўваецца асобнік рукапіснага часопіса **“Моладзь”** за сакавік 1925 г., які рыхтаваўся гуртком беларускай моладзі ў Даўгаўпілсе. Выданне складалася з артыкулаў, прысвечаных угодкам БНР і Францыску Скарыну і было аздоблена

малюнкамі ад рукі. Таксама на старонках часопіса было эсэ *Мэты кожнага народу*. Усе артыкулы былі ананімныя[692]. Увесну 1932 г. у медыйнай прасторы з'явілася інфармацыя, што таварыства "Беларуская хата" плануе выдаваць газету **"Беларускае жыццё",** рэдактарам якой мусіў стаць М. Дзямідаў[693]. Аднак ніякіх звестак пра рэалізацыю дадзенай задумы няма. Хутчэй за ўсё, праект не выйшаў па-за межы плану. 9 верасня 1932 г. сябры праўлення БНКТЛ выказалі думку наконт выдання супольна з Беларускім выдавецтвам у Латвіі штомесячніка па-латышску, які б інфармаваў латышскае грамадства пра беларусаў і іх культуру. На пасаду адказнага рэдактара выдання была прапанаваная кандыдатура К. Езавітава[694]. 14 верасня 1932 г. ён атрымаў дазвол МУС на выданне штомесячніка **"Baltkrieviu Latvija"**. Аднак праект быў адкладзены, пакуль не знойдзецца крыніца фінансавання. Аналіз выяўленых дакументаў паказвае, што праз адсутнасць сродкаў задуму не ўдалося ажыццявіць[695].

На падставе даступных нам крыніц можна меркаваць, што ў перыяд з 1923 па 1933 гг. у Латвіі пабачыла свет не менш як 14 выданняў, якія можна аднесці да катэгорыі прэсы. Месцам выдання большасці перыёдыкаў была Рыга. Некаторыя выходзілі – у Даўгаўпілсе (5) і Лудзы (1). Такім чынам геаграфія беларускай прэсы ў Латвіі адпавядала рассяленню беларускай меншасці. Асноўнымі тэматычнымі напрамкамі прэсы былі грамадска-палітычны і культурна-асветны. Аўтары і выдаўцы намагаліся з дапамогай друкаванага слова праводзіць палітычную і нацыянальна-культурную агітацыю сярод беларускамоўнага насельніцтва. Прысутнічала і сельскагаспадарчая праблематыка ("Голас беларуса", "Гаспадар"), што было абумоўлена сацыяльным складам латвійскіх беларусаў і жаданнем беларускага актыву паўплываць на латгальскую вёску. Асобна асвятлялася адукацыя: шмат артыкулаў, прысвечаных школьнай справе, друкавалася на старонках грамадска-палітычных выданняў, таксама існавалі профільныя перыёдыкі ("Беларуская школа ў Латвіі", "Школьная праца", "Школа і жыццё"). Няма нічога дзіўнага, бо менавіта школы разглядаліся як кузня нацыянальнай самасвядомасці. Цяжка вызначыць узровень уплыву беларускай прэсы на сялянскія і гарадскія масы. Прааналізаваўшы змест перыёдыкаў і архівы асобных рэдакцый, можна зрабіць выснову, што вакол беларускамоўных выданняў склалася

---

[692] Д. Крэнт, *Матэрыялы Цэнтра даследаванняў старадрукаваных кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі як крыніца па гісторыі беларускага нацыянальна-культурнага жыцця ў Латвіі ў 1920–1930-ыя гг.*, "Латыши и беларусы: вместе сквозь века" 2023, № 12, с. 120.

[693] *Хроніка беларускага жыцьця ў Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 1(11), с. 160.

[694] LVVA, 1897 f., 1 ap., 2 l., 14 lp.

[695] LVVA, 1897 f., 1 ap., 2 l., 16 lp.

кола сталых чытачоў і прыхільнікаў. У асноўным яны паходзілі з мясцовай інтэлігенцыі (настаўнікі і вучні, актывісты культурна-асветных таварыстваў). Аднак масавага характару прэса не займела праз цяжкае матэрыяльнае становішча беларускага насельніцтва і значны працэнт непісьменных. Паўплывала і канкурэнцыя з боку іншамоўных заможнейшых выданняў. Нягледзячы на гэта, беларуская прэса ў Латвіі з'яўляецца каштоўнай крыніцай па гісторыі беларускага нацыянальнага руху ў гэтай краіне.

Падводзячы вынікі кароткай гісторыі беларускай прэсы ў міжваеннай Латвійскай Рэспубліцы, можна зрабіць некалькі высноваў. Выданне беларускіх перыёдкаў было ініцыятывай жменькі мясцовых актывістаў, сярод якіх пачэснае месца належыць К. Езавітаву – рэдактару і выдаўцу двух найбольш уплывовых і даўгавечных медыйных праектаў Латвіі ("Голас беларуса" і "Беларуская школа ў Латвіі"). Неблагі вынік мела і вучнёўскае выданне Даўгаўпілскай беларускай гімназіі "Школьная праца", што з'яўлялася заслугай дырэктара С. Сахарава. Але большасць перыёдыкаў былі аднаднёўкамі або выданнямі, якія выходзілі непрацяглы час і выпусцілі ўсяго па некалькі нумароў. Аднак нават тыя нешматлікія выданні, якім удалося праіснаваць некалькі гадоў, выходзілі нерэгулярна і са значнымі перапынкамі. Асноўнай прычынай нерэгулярнасці беларускай прэсы была хранічная нястача грошай, з якой мусілі змагацца выдаўцы. Усе выданні трымаліся коштам самаахвярнасці выдаўцоў, аўтараў і чытачоў. Іншыя крыніцы фінанасавання былі абмежаванымі і нерэгулярнымі. Беручы пад увагу незаможнасць беларускай меншасці, не дзівіць, што мясцовая беларуская прэса знаходзілася ў гаротным стане. Неабходна пагадзіцца з аўтарамі, якія лічаць, што менавіта адсутнасць грошай, а не грамадска-палітычная сітуацыя была галоўнай прычынай знікнення мясцовай беларускай прэсы на пачатку 1930-х гг.[696]

Кнігавыдавецкая дзейнасць

Побач з прэсай, кнігавыданне належала да найважнейшых сродкаў нацыянальнай агітацыі ў разгляданы час. І беларускі актыў Латвіі надаваў гэтай сферы належную ўвагу. Пачынальнікам беларускай кнігавыдавецкай працы ў Латвіі з'яўляецца К. Езавітаў. У 1926 г., дзякуючы яго намаганням, было заснаванае "Беларускае выдавецтва ў Латвіі" (БВЛ) (*Baltkrievu izdevniecība Latvijā*). Да стварэння выдавецтва яго падштурхнула нястача беларускамоўных падручнікаў у мясцовых нацыянальных школах. Невыпадкова, што першай выдавецкай ластаўкай БВЛ стала выданне ў 1926 г. чытанкі аўтарства К. Езавітава *Беларуская школа. Першая пасля леманатара кніга*

[696] M. Jankowiak, *Prasa białoruska międzywojennej Łotwy (przegląd wydawnictw)*, "Studia Białorutenistyce" 2021, t. 15, s. 27.

для чытання. Згодна з задумай аўтара, кніга павінна была стаць працягам чытанкі *Зорка: першая навука чытання і пісання для беларускіх дзетак* Аляксандры Смоліч (Рыга, 1922 г.). Выданне было падрыхтаванае на падставе прац Івана Пратасевіча і Івана Самковіча, а таксама Язэпа Лёсіка, Аляксандры Смоліч, Якуба Коласа, Сцяпана Некрашэвіча і інш., дапоўнена вершамі К. Езавітава і ілюстрацыямі Крамарава[697].

Анансуючы выданне кнігі ў верасні 1926 г., кіраўніцтва БША рэкамендавала ўсім кіраўнікам беларускіх школ замовіць гэтую кнігу, склаўшы запыты на колькасць патрэбных асобнікаў па цане 1 лат 70 сантымаў[698]. 5 кастрычніка 1926 г., калі праца з падручнікам набліжалася да канца, укладальнік прапанаваў кіраўніку Беларускага школьнага аддзела адкласці друк кнігі з 15 лістапада 1926 г. на 15 студзеня 1927 г. К. Езавітаў абгрунтоўваў гэта тым, што ў Менску ў гэты час планавалася беларуская акадэмічная канферэнцыя – каб "гэтае першае саліднае выданне Беларускага аддзела было зроблена ўжо па новым беларускім правапісе"[699]. Аднак кіраўнік БША не пагадзіўся з прычыны пільнай патрэбы падручнікаў у беларускіх школах[700]. 28 кастрычніка 1926 г. Рада Беларускага школьнага аддзела даручыла справу выдання падручнікаў Беларускаму выдавецтву ў Латвіі. У пастанове чытаем: "*Рада Беларускага аддзела, разгледзеўшы становішча, якое стварылася ў звязку з тым, што Беларускае выдавецтва ў Вільні апошнія гады заняпала, а падручнікі з Радавай Беларусі не могуць быць выкарыстаны для нашых школ у Латвіі, пастанаўляе прыступіць да выдання беларускіх падручнікаў у Латвіі і прызначыць для гэтае мэты на наступны аператыўны год 2000 латаў, а таксама прасіць Культурны фонд аб дапамозе гэткай самай сумай. Пастаўленне кніжок даручыць гр. К. Езавітаву, а іх друк – Беларускаму выдавецтву ў Латвіі. Стварыць камісію ў складзе: Кіраўніка аддзела, складальніка і трох педагогаў, гр. Шчорса, Дзямідава і Сіцько*"[701].

Друк падручніка замарудзіўся праз змену друкарні і пошук новай, якая магла б надрукаваць літару "ў". 20 снежня 1926 г. кіраўніцтва Беларускага школьнага аддзела было вымушана звярнуцца ў Беларускае выдавецтва ў Латвіі з просьбай прыспешыць выданне такам чынам, каб кніга была разасланая школам да 15 студзеня 1927 г. У звароце звярталася ўвага на

---

[697] А. Чарняўскі, *Выдавецкая дзейнасць беларускай нацыянальнай меншасці ў міжваеннай Латвіі (1918–1940 гг.)*, "Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Серыя 1. Гісторыя і археалогія. Філасофія. Паліталогія" 2023, т. 15, № 3, с. 60.

[698] У цыркуляры Беларускага школьнага аддзела чытаем: "*Кніга будзе мець каля 160 старонак і прыстасавана для першай, а ў тых выпадках, калі яна не чыталася вучнямі ў першай, дык для гэтых самых вучняў будзе гадзіцца і ў другой клясе*". LVVA, 2125 f., 5 ap., 76 l., 6 lp.

[699] LVVA, 2125 f., 5 ap., 75 l., 74 lp.

[700] LVVA, 2125 f., 5 ap., 75 l., 80 lp.

[701] LVVA, 2125 f., 5 ap., 10 l., 13 lp.

тое, што кніга вельмі патрэбная і школы з нецярплівасцю чакаюць яе[702]. Падручнік быў надрукаваны ў двух варыянтах: у мяккай і цвёрдай вокладках. У выпадку замовы апошняга, за кожны асобнік належала заплаціць са школьных сродкаў па 10 лат[703]. На пачатку 1927 г. падручнік быў разасланы па школьных бібліятэках. Пры гэтым найбяднейшыя вучні атрымалі яго бясплатна[704].

Наступным крокам у справе забеспячэння беларускіх школ навучальнай літаратурай стала перавыданне ў 1927 г. чытанкі Язэпа Лёсіка *Наша крыніца: чытанне для беларускіх школ у Латвіі*[705]. Адначасова была выдадзеная ў перакладзе на беларускую мову праца Канстанціна Пажытнова прысвечаная кааператыўнай дзейнасці[706]. У гэтым жа годзе намаганнямі К. Езавітава была выдадзена праца Антона Луцкевіча *Як вучыць у новай школе*, наклад якой склаў 2 тыс. асобнікаў. Праз два гады пабачыла свет кніга *Беларусь у мінулым і сучасным: канспект пазашкольнаму працаўніку для лекцыяў з чароўным ліхтаром*, якое К. Езавітаў падрэдагаваў у адпаведнасці з патрэбамі латвійскіх школ. Ён дадаў раздзел, прысвечаны Латвіі, яе народу і культуры, а таксама беларускай меншасці. Акрамя таго, у кнізе былі змешчаныя вершы К. Езавітава і яго пераклады твораў Я. Райніса[707]. Аўтар прапанаваў выкарыстоўваць для правядзення культурна-асветнай працы дыяпазітывы, якія ён падрыхтаваў яшчэ ў 1922 г. па наступных тэмах: *Паходжанне беларускага народа*, *Пачаткі беларускай дзяржаўнасці*, *Нацыянальна-адраджэнскі рух*, *Сучаснае становішча беларускага народа*. З удзелам К. Езавітава складаліся навучальныя праграмы для беларускіх пачатковых школ па гісторыі Латвіі, краязнаўстве і іншы прадметах[708].

У 1929 г. БВЛ выдала на латышскай мове даследаванне Мацільды Езавітавай, прысвечанае беларускай культуры і літаратуры[709]. Нягледзячы

---

[702] LVVA, 2125 f., 5 ap., 75 l., 99 lp.

[703] LVVA, 2125 f., 5 ap., 391 l., 20 lp.

[704] *Падручнікі для беларускіх школ у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1927, № 4(2), с. 42.

[705] Я. Лёсік, *Наша крыніца: чытаньне для беларускіх школ у Латвіі*, Выд. 3-е, стэрэатыпнае, з асобнымі дадаткамі, зробленымі К. Езавітавым і прыпасованымі да патрэбаў латвійскіх школ, Рыга 1927.

[706] К. А. Пажытноў, *Папулярныя вочаркі па тэорыі кааперацыі*, Рыга 1927, с. 87.

[707] А. Чарняўскі, *Выдавецкая дзейнасць беларускай нацыянальнай меншасці ў міжваеннай Латвіі (1918–1940 гг.)*, "Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Серыя 1. Гісторыя і археалогія. Філасофія. Паліталогія" 2023, т. 15, № 3, с. 60–61.

[708] А. Вабішчэвіч, *"Але ж шлях да свабоды старонка праложа!"* [у:] *Сыны і пасынкі Беларусі,* рэд. С. Барыс, Менск 1996, с. 336; С. Раўнейка, *Педагагічна-асветніцкая дзейнасць К. Езавітава* [у:] *III межвузовская научно-методическая конференция молодых ученых (12–15 июня 2001 г.). Сборник материалов*, Брест 2001, с. 64.

[709] M. Jezovitova, *Vecā baltkrievu kultūra un literatura*, Rīga 1929; M. Jezovitovas, *Īss jaunās baltkrievu literaturas pārskats,* Rīga 1929.

на ўдалы пачатак, кіраўнік выдавецтва стрымана ацэньваў шанцы на хуткі ўздым беларускай выдавецкай працы ў Латвіі. У лісце да А. Чарвякова (20 жніўня 1828 г.) ён пісаў: "*У гэтым годзе маемо на друк усяго 50.000 латв. рублёў, або каля 200 даляраў. Зразумела, за гэтыя грошы ледзь-ледзь можна выдаць першую чытанку. А патрэба ў кнігах надзвычайная. У будучым годзе, відаць, атрымаемо ад Латвійскага ўрада яшчэ адну-дзве кніжкі. Паставіць выданне кніжок на камерцыйны грунт у нас яшчэ не прыйшла пара, бо жыхарства купляць кнігі не можа, да і не прызвычаілася яшчэ*"[710].

Іншым выдавецкім гатункам, які быў узяты на варштат кіраўніком БВЛ, стала паэзія. У 1929 г. выйшаў зборнік вершаў Пятра Сокала (сапраўд.: П. Масальскі) *На світанні*, у якім была паэма *Латгаліяда*, вершы і пераклады з латышскай на беларускую мову[711]. Варта адзначыць, што з'яўленне гэтага выдання не адбылося без прыгод. Яшчэ на этапе выдання латвійскія ўлады былі поўныя недаверу да яго. У ліпені 1929 г. Аддзел прэсы і грамадскіх арганізацый МУС Латвіі звярнуў увагу, што машынапіс утрымлівае выступленні супраць Латвіі і яе дзяржаўнага ладу. Маладога паэта абараняў К. Езавітаў, які ў лісце (27 ліпеня 1929 г.) аўтару пісаў: "*Я растлумачыў, што ўсе вершы друкаваліся ўжо на працягу 6-ці год, што ў іх ёсць заклікі да ратавання Беларусі ўсяе і змагання з ворагамі Беларусі, да якіх Латвію аднесці няможна, што вершы выразна накіраваны супраць тых, хто не дапушчае Беларусь да дзяржаўнага і культурнага самавызначэння, а Латвія тутака ні пры чым, нідзе супраць яе не сказана ні слова. На гэта мне Вільдэ, што 'затое нідзе і не сказана, што вершы накіраваны супроць Польшчы, а трэба гэта было падкрэсліць'. Я зазначыў, што нашы чытачы добра ведаюць гісторыю Беларусі і ім падкрэсліваць і разжоўваць нічога не патрэбна, і нават гэта было б дзіўна. Нібыта, удалося яго пераканаць, але трэба Вам прадумаць увесь зборнік і кажнае ў ім слова, каб быць нарыхтаваным да адказу, калі Вас запытаюць*"[712]. Кіраўнік БВЛ меў рацыю, паколькі ў вершы сапраўды гаворка ішла пра Польшчу і яе палітыку адносна беларусаў. Пасля яго тлумачэнняў прадстаўнікі латвійскага МУС гэта зразумелі, але на ўсялякі выпадак параілі аўтару зборніка падкрэсліць у вершах, што ён мае на ўвазе польскую, а не латвійскую дзяржаву[713]. Нягледзячы на гэта, у 1930 г. падчас арышту К. Езавітава следчыя разглядалі інцыдэнт з вершам як праяву яго антыдзяржаўнай дзейнасці. Гаворка ішла пра верш, напісаны П. Сокалам у Лудзы 24 лютага 1924 г. Паліцыю турбаваў факт,

---

[710] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 22 lp., Ліст К. Езавітава А. Чарвякову, 20 жніўня 1928 г.

[711] П. Сакол, *На сьвітанні: першы зборнік вершаў*, Рыга 1929.

[712] LVVA, 3235 f., 6 ap., 196 l., Ліст К. Езавітава да П. Масальскага, 27 ліпеня 1929 г.

[713] Тамсама.

што вершы рассылаліся па школах, у тым ліку трапілі ў Даўгаўпілскую беларускую гімназію[714].

Плённым для БВЛ быў 1932 год, калі К. Езавітаў выдаў твор Францішка Аляхновіча *У лясным гушчары. Казка ў 1 акце*. У гэтым жа годзе выйшла пасмяротнае выданне апавядання Віктара Вальтара *Леснікова сена*. Планавалася таксама выдаць іншае адпавяданне гэтага аўтара *Народжаныя пад Сатурнам*. З гэтай мэтай у 1931 г. беларускае настаўніцтва Латвіі пачало збор сродкаў. Складкі (у памеры не менш як 10 латаў) збіралі С. Сахараў і Ф. Клагіш[715]. Аднак задуме не было наканавана здзейсніцца. БВЛ зрабіла няўдалую спробу выдаць творы яшчэ аднаго маладога і заўчасна памерлага латвійскага беларуса – Якуба Воркуля. У 1932 г. К. Езавітаў звярнуўся да грамадскасці з заклікам даслаць яго творы (надрукаваныя і ненадрукаваныя: лісты, здымкі, сшыткі, вершы, дакументы) для апрацоўкі і выдання[716]. Поспехам скончыўся іншы выдавецкі праект. У 1933 г. выйшла ў перакладзе на беларускую мову кніга твораў латышскага драматурга і празаіка Андрэйса Упітса (*Andrejs Upīts*)[717].

Апрача літаратурнай і педагагічнай тэматыкі, намаганнямі БВЛ выдавалася літаратура грамадскага і навуковага характару, у тым ліку пераклады замежных аўтараў. У 1927 г. выйшла праца К. Езавітава *Беларусы ў Латвіі* – першая спроба апісання гісторыі беларускай меншасці ў гэтай краіне. Храналагічна праца ахоплівала перыяд з моманту з'яўлення першых праяў нацыянальнай актыўнасці да беларускага працэсу. Звяртае ўвагу тое, што кніга незавершаная. Найверагодней, гэта адбылося праз адсутнасць матэрыяльных сродкаў на выданне. Сведчыць аб гэтым і факт, што яшчэ ў ліпені 1930 г. не быў надрукаваны ўвесь наклад кнігі[718]. У 1927 г. быў выдадзены *Статут Таварыства беларускіх вучыцялёў у Латвіі*. У 1932 г. пабачылі свет дзве гістарычныя працы К. Езавітава – *Беларускае культурна-асветнае т-ва Бацькаўшчына ў Латвіі* і *Беларусы ў Літве*. З нагоды 10-годдзя беларускай школьнай справы ў Латвіі 16 ліпеня 1931 г. Рада БША пастанавіла выдаць альманах *Дзесяць год беларускае школы ў Латвіі*. Выданне планавалі раздаць вучням. У склад выдавецкай камісіі ўвайшлі: К. Езавітаў, Н. Пінская і П. Журкоўскі (з чэрвеня 1932 г. – М. Дзямідаў). Было вырашана звярнуцца да беларускага настаўніцтва і грамадскасці з заклікам ахвяраваць на выданне

---

[714] LVVA, 3235 f., 2 apr., 4635 l., 142–144 lpp.

[715] *Ад Рэдакцыі,* "Думка беларуса" 1931, № 1, с. 3.

[716] *Дапамажэце сабраць матар'ялы аб дачасна памёршым беларускім паэце Якубе Воркулю*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 5(15), с. 211.

[717] LVVA, 2067 f., 1 ap., 364 l., 276 lp.

[718] А. Чарняўскі, *Выдавецкая дзейнасць беларускай нацыянальнай меншасці ў міжваеннай Латвіі (1918–1940 гг.)*, "Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Серыя 1. Гісторыя і археалогія. Філасофія. Паліталогія" 2023, т. 15, № 3, с. 60.

1% месячнага заробку ў перыяд ад 1 жніўня да 1 лістапада 1931 г. Зборам сродкаў займаліся: на Лудзеншчыне – С. Казека, на Даўгаўпілшчыне – С. Маціеўскі, у Рызе – Я. Камаржынскі. Адначасова камісія заклікала кіраўнікоў школ дасылаць матэрыялы, у тым ліку фотаздымкі[719]. Камісія, аднак, не была задаволеная вынікамі працы, бо праз нястачу сродкаў БША выкрасліў з бюджэту фінансаванне выдання. Матэрыялы пра свае школы даслалі толькі нешматлікія настаўнікі, іншыя абмежаваліся частковымі звесткамі[720]. Тым не менш, кніга пабачыла свет у Рызе ў 1932 г. Укладальнікамі выдання былі К. Езавітаў, М. Дзямідаў і Н. Пінская, яго наклад быў 1 тыс. асобнікаў. Працягам выдання навуковых прац было з'яўленне ў 1933 г. у Рызе кнігі Змітра Даўгялы *Літоўская мэтрыка і яе каштоўнасьць для вывучэньня мінуўшчыны Беларусі*, прадмову да якой падрыхтаваў К. Езавітаў. Ён заклікаў чытачоў да захавання і пашырэння гэтай крыніцы падкрэсліваючы яе вагу і істотнасць у вывучэнні мінуўшчыны[721]. У 1934 г. у выдавецтве выйшла брашура Сцяпана Сіцько *Дзесяцігодзьдзе 1-ае Рыскае Беларускае асноўнае школы (1923–1933)*[722]. Аналіз даступных крыніц дазваляе меркаваць, што за час сваёй дзейнасці ў 1926–1934 гг. БВЛ выдала каля 20 кніг і брашур.

Беларускае выдавецтва ў Латвіі не існавала ў ізаляцыі ад беларускіх выдаўцоў па-за межамі латвійскай дзяржавы. Кіраўнік БВЛ падтрымліваў сувязі з калегамі ў іншых дзяржавах. Прадукцыя БВЛ рассылалася ў беларускія асяродкі розных краін. Сведчыць аб гэтым факт, што на звароце тытульнага аркуша працы К. Езавітава *Беларусы ў Літве* змяшчаўся спіс месцаў, дзе чытачы маглі набыць выданне. Апрача Рыгі, Даўгаўпілса і Лудзы, у ім знаходзіліся Вільня, Коўна, Берлін, Прага і Чыкага. Дзякуючы кантактам К. Езавітава з дзеячамі Хаўруса беларускай працоўнай эміграцыі ў Францыі, у 1933 г. у французскія бібліятэкі трапіла партыя кніг БВЛ, у тым ліку *Папулярныя вочаркі па тэорыі кааперацыі* К. Пажытнова. Беларускае выдавецтва ў Латвіі не мела ўласнага друкарскага абсталявання, таму вымушанае было карыстацца паслугамі рыжскіх друкарняў. Значная колькасць выданняў БВЛ пабачыла свет у друкарні Г. Ігэ. Выйшла там, напрыклад, кніга Ф. Аляхновіча *У лясным гушчары*. Іншыя, як, напрыклад, працы М. Езавітавай з гісторыі беларускай літаратуры, былі надрукаваныя ў друкарні Э. Піпіньша і Я. Упманіса[723].

---

[719] *Дзесяць год Беларускае Школы ў Латвіі 1921–1931*, Рыга 1932, с. 3–4.

[720] *Хроніка беларускага жыцьця ў Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 1(11), с. 160.

[721] Н. Голубева, *Беларусы ў Латвіі* [у:] *Беларускае замежжа*, рэд. Н. Голубева, Менск 2010, с. 198.

[722] С. Сіцько, *Дзесяцігодзьдзе 1-ае Рыскае Беларускае асноўнае школы (1923–1933)*, Рыга 1934.

[723] А. Чарняўскі, *Выдавецкая дзейнасць беларускай нацыянальнай меншасці ў міжваеннай Латвіі (1918–1940 гг.)*, "Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Серыя 1. Гісторыя і археалогія. Філасофія. Паліталогія" 2023, т. 15, № 3, с. 62.

Незалежна ад БВЛ выдавецкай дзейнасцю займаўся Беларускі школьны аддзел, з мэтай забеспячэння беларускіх навучальных устаноў Латвіі падручнікамі. Як ужо адзначалася, першым плёнам выдавецкай працы БША была чытанка Аляксандры Смоліч. У 1925–1926 гг. дзякуючы БША выйшаў шэраг метадычных выданняў для настаўнікаў беларускіх пачатковых школ. Асаблівая ўвага надавалася выкладанню гісторыі Латвіі, таму асобна выйшла праграма па гэтай дысцыпліне. Гісторыя Латвіі ў беларускіх школах вывучалася ад 3-га класа. Першыя два гады (класы 3 і 4) прадмет выкладаўся на беларускай мове, а пасля – на дзяржаўнай[724].

Кіраўніцтва БША ўсведамляла патрэбу захавання памяці пра сваю дзейнасць, таму Рада 29 кастрычніка 1926 г. пастанавіла стварыць камісію, якая б занялася падрыхтоўкай выдання па гісторыі Беларускага школьнага аддзела. У склад камісіі мусілі ўвайсці К. Езавітаў, Р. Плыгаўка і Н. Пінская. Мяркуючы па ўсім, праект не пайшоў далей абмеркавання[725]. Іншыя выдавецкія ініцыятывы былі больш паспяховымі. У 1927 г. у Рызе выйшла *Праграма краязнаўства для беларускіх пачатковых школ*. Мэтай выдання была дапамога настаўнікам у выкладанні краязнаўства, якое кіраўніцтва БША лічыла важным элементам выхавання моладзі. Праграма ахоплівала такія тэмы, як: "Зіма і зімовыя працы", "Вясновыя працы", "Ахова здароўя ў дзяцей", "Пагода", "Адзежа", "Сад, горад і поле", "Вёска і горад", "Жыллё", "Дамовыя птушкі", "Чалавек", "Наш горад", "Наша вёска", "Наш край"[726]. У 1928 г. выйшаў падручнік У. Пігулеўскага *Геаграфія* для трэцяга класа асноўнай школы. Выданне складалася з раздзелаў, прысвечаных веданню мапаў і планаў, паверхні Зямлі, гідралогіі, кліматалогіі, батаніцы, заалогіі, Латвіі і яе гарадам. У тым жа годзе выйшла яшчэ адна кніга У. Пігулеўскага *Наш край. Зборнік краязнаўства*. На пачатку 1930-х гг. міністэрства выдала падручнікі *Кароткая гісторыя Латвіі* О. Свэнэ і *Геаграфія для пачатковых школ* Э. Томаса і Ю. Навасёлава, якую пераклаў на беларускую мову П. Масальскі[727].

Варта адзначыць выдавецкі высілак настаўнікаў Лудзенскай і Даўгаўпілскай беларускіх гімназій. Першыя ў 1924 г. уласнымі намаганнямі падрыхтавалі і выдалі зборнік паэзіі сваіх вучняў пад назвай *Ластаўка*. Укладальнікам быў дырэктар К. Езавітаў[728]. У 1927 г. даўгаўпілскія педагогі апублікавалі *Гістарычны нарыс пяцьгодзьдзя Дзьвінскай Дзяржаўнай Беларускай Гімназіі*

---

[724] LVVA, 2125 f., 5 ap., 309 l., 53 lp.

[725] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 35 lp.

[726] LVVA, 2125 f., 5 ap., 77 l., 15 lp.

[727] А. Чарняўскі, *Выдавецкая дзейнасць беларускай нацыянальнай меншасці ў міжваеннай Латвіі (1918–1940 гг.)*, "Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Серыя 1. Гісторыя і археалогія. Філасофія. Паліталогія" 2023, т. 15, № 3, с. 62.

[728] *Ластаўка: зборнік вучнёўскіх твораў Дзяржаўнай Лудзенскай Беларускай Гімназіі у Латвіі: за 1923–1924 вучэбны год*, укл.: К. Езавітаў, Лудза 1924.

за 1922–1927 гг., укладальнікам якой быў дырэктар С. Сахараў[729]. Выданне аздобілі ілюстрацыі, на якіх было прадстаўлена школьнае жыццё. Кніга рассылалася настаўнікам і вучням беларускіх школ[730]. Выданне выйшла за сродкі, атрыманыя з бюджэту БША (200 латаў) на святкаванне 5-годдзя гімназіі. Пераскіраваць іх на друк брашуры прапанаваў 25 траўня 1927 г. С. Сахараў[731]. Аднак пасля высветлілася, што выданне будзе каштаваць 300 латаў. Тады 13 верасня 1927 г. на прапанову С. Сахарава школьная рада звярнулася ў Культурны фонд Латвіі з просьбай выдаткаваць яшчэ 100 латаў[732].

Займаліся кнігавыданнем і некаторыя грамадскія культурна-асветныя таварыствы. Сярод іх належыць узгадаць кааператыў "Культура і праца", намаганнямі якога пабачыў свет *Беларускі каляндар за 1928 год*[733]. Рэдактарамі выступалі У. Пігулеўскі, К. Езавітаў і Н. Пінская. Выданне мела больш за 70 старонак, а напрыканцы ўтрымлівала даведку пра беларускія арганізацыі і перыядычныя выданні Латвіі: з адрасамі, персанальным складам, фотаздымкамі беларускіх дзеячоў[734].

Варта адзначыць выдавецкі высілак Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў (пра саму арганізацыю гаворка будзе ў наступным раздзеле). У красавіку 1926 г. кіраўніцтва заклікала сяброў таварыства ахвяраваць на выдавецкую працу – і ў тым самым годзе выйшлі друкам яго статут і праграма. Паколькі пры таварыстве працаваў навукова-краязнаўчы гурток, у 1926 г. на яго патрэбы была выдадзеная брашура *Бярыцеся ўсе за навукова-дасьледчую працу*[735] і *Інструкцыя для працы аддзелаў Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў*[736]. Акрамя таго, з ініцыятывы кіраўніка таварыства К. Езавітава, была заснаваная выдавецкая серыя "Бібліятэка беларуса-выбаршычыка", у якой друкаваліся выданні на бягучыя ідэйныя і практычныя патрэбы беларускай меншасці. У серыі пабачыла свет не менш як 15 кніг і брашур. Некаторыя выдавецкія праекты атрымалі вядомасць таксама па-за межамі Латвіі. Яшчэ ў ліпені 1925 г. К. Езавітаў звярнуўся да рэгіянальных аддзелаў Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў з прапановай прафінансаваць выданне матэрыялаў судовага працэсу над беларускімі дзеячамі ў Латгаліі. 9 красавіка 1926 г.

---

[729] *Гістарычны нарыс пяцігодзьдзя Дзьвінскай Дзяржаўнай Беларускай Гімназіі за 1922–1927 г.г.*, укл.: С. Сахараў, Дзьвінск 1927.

[730] LVVA, 2067 f., 1 ap., 376 l., 20 lp.

[731] LVVA, 2067 f., 1 ap., 376 l., 15 lp.

[732] LVVA, 2067 f., 1 ap., 376 l., 20 lp.

[733] *Беларускі каляндар 1928*, Рыга 1928.

[734] А. Чарняўскі, *Выдавецкая дзейнасць беларускай нацыянальнай меншасці ў міжваеннай Латвіі (1918–1940 гг.)*, "Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Серыя 1. Гісторыя і археалогія. Філасофія. Паліталогія" 2023, т. 15, № 3, с. 62.

[735] К. Езавітаў, *Бярыцеся ўсе за навукова-дасьледчую працу*, Рыга 1926.

[736] *Інструкцыя для працы аддзелаў Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў*, Рыга 1926.

на пасяджэнні кіраўніцтва таварыства было вырашана выдаць працу *Беларускі працэс у Латвіі*[737]. У выніку праз год кніга пабачыла свет. У выданні былі сабраны дакументы і матэрыялы судовага працэсу супраць кіраўнікоў беларускага руху ў 1925 г.[738] У 1926 г., дзякуючы руплівасці К. Езавітава, выйшла праца Аляксандра Цвікевіча (пад псеўданімам Алесь Галынец) *Вялікае апрашэнне ці вялікае ўдасканаленне*[739].

Акрамя выданняў грамадска-палітычнага характару К. Езавітаў намагаўся не губляць з вачэй літаратурную тэматыку. 10 ліпеня 1926 г. сход гуртка заслухаў яго даклад аб патрэбе выдаць зборнік маладых паэтаў *Першы крок*. Кастусь Езавітаў абгрунтоўваў патрэбу выдання тым, што ў выніку яго працы ў Лудзенскай гімназіі быў створаны гурток маладых беларускіх паэтаў, вершы якіх ужо друкаваліся ў *Літаратурным кутку* газеты "Голас беларуса", а цяпер надышоў час выдаць іх асобным зборнікам. Сход разгледзеў творы 20 кандыдатаў і зацвердзіў іх да друку[740]. У 1926 г. коштам Таварыства выбаршчыкаў-беларусаў кніга *Першы крок. Зборнік вершаў гуртка маладых беларускіх паэтаў у Латвіі* пабачыла свет. У зборніку (88 старонак) былі творы 20 аўтараў. І сам К. Езавітаў (пад псеўданімам "Кастусёнак") надрукаваў там дваццаць сваіх вершаў. У выданне трапілі маладыя таленты – Пятро Масальскі (псеўданім: Пятро Сокал), Валянціна Казлоўская (псеўданім: Лясная кветка), Антон Лейтан, Якуб Воркуль, Эдвард Вайводзіш, Алена Іванова і інш. Рэдакцыя газеты "Голас беларуса" з гонарам вітала выданне зборніка разглядаючы яго як праяву росту нацыянальнай свядомасці новага пакалення латвійскіх беларусаў: "*Новыя літаратурныя беларускія сілы, узрошчаныя на глебе беларускае меншасці ў Латвіі, яскрава гавораць аб тым, што нацыянальная свядомасць латвійскіх беларусаў значна ўзрасла і што на змену паасобных адзінак, – пачынальнікаў беларускага руху ў Латвіі, – ужо ідзе новае пакаленне, якое здолее замацаваць і расшырыць набытыя нацыянальныя дасягненні*"[741]. Актыўнасць маладых паэтаў была заўважаная па-за межамі Латвіі: у першым томе *Літаратурнай энцыклапедыі* (Масква 1929) у артыкуле *Беларуская літаратура* згадвалася пра з'яўленне маладых паэтаў сярод латвійскіх беларусаў[742].

Кіраўніцтва Таварыства выбаршчыкаў-беларусаў планавала выдаць ілюстраваную брашуру *Пяць гадоў беларускае адраджэнчае працы ў Латвіі*

---

[737] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 135, л. 5.

[738] LVVA, 3009 f., 1 apr., 3 l., 68, 71 lpp.

[739] А. Галынец, *Вялікае апрашэньне ці вялікае ўдасканаленьне*, Рыга 1926.

[740] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 155–156 lpp., Праца Беларускага навукова-краязнаўчага гуртка ў Рызе (пры Т-ве беларусаў – выбаршчыкаў, 19 жніўня 1928 г.

[741] *Нашы першыя ўгодкі*, "Голас беларуса" 1926, № 8 ад 10 чэрвеня, с. 1.

[742] М. Шапіра, *"Лясная Кветка" (Лёс Валянціны Казлоўскай)* [у:] П. Сокал, В. Казлоўская, *Выбраныя творы*, рэд. М. Казлоўскі, С. Панізнік, Менск 2016, с. 142–143.

(1921–1926). На сходзе навукова-краязнаўчага гуртка таварыства 1 ліпеня 1926 г. было вырашана даручыць К. Езавітаву падрыхтоўку юбілейную кнігу і звярнуцца да беларускага настаўніцтва па матэрыялы аб становішчы асобных беларускіх школ[743]. Аднак заклік К. Езавітава да настаўнікаў і арганізацый дасылаць матэрыялы не знайшоў належнага водгуку. У жніўні 1926 г. К. Езавітаў яшчэ раз заклікаў настаўнікаў дасылаць падрабязныя звесткі пра свае школы, а грамадскіх актывістаў – інфармацыю пра гісторыю сваіх таварыстваў[744]. К. Езавітаў на старонках "Голасу беларуса" прасіў пра здымкі, артыкулы, успаміны і разважанні пра пачаткі беларускай працы ў Латвіі[745].

Асобна належыць звярнуць увагу на выданні Беларускага навукова-краязнаўчага таварыства ў Латвіі. Восенню 1932 г. управа БНКТЛ і найбольш актыўныя сябры таварыства вырашылі, што іх гадавыя складкі будуць прызначаныя на выдавецкі фонд арганізацыі[746]. У гэтым жа годзе арганізацыя надрукавала свой статут, які быў разасланы з мэтай продажу (кошт 40 сантымаў) у кнігарню В. Мінкевіча ў Вільні і ў Даўгаўпілскую беларускую гімназію –па 20 асобнікаў, у рыжскія школы і на настаўніцкія курсы – па 10 асобнікаў[747]. Нягледзячы на добры пачатак выдавецкая праца таварыства не мела поспеху, а многія выдавецкія ініцыятывы так і засталіся на паперы. На пачатку 1930 г. сябра БНКТЛ П. Масальскі пачаў складаць латышска-беларускі слоўнік на 25 тыс. слоў. Латышска-беларускіх слоўнікаў яшчэ не існавала, у выніку латвійскія беларусы мусілі карыстацца латышска-рускімі[748]. Аднак да выдання справа не дайшла. Падобны лёс напаткаў і іншыя выдавецкія задумы. У красавіку 1931 г. К. Езавітаў прапанаваў Язэпу Драздовічу выдаць альбомам яго этнаграфічныя замалёўкі. У лісце Рыгору Шырму кіраўнік БНКТЛ пісаў, што даўно наспеў час выдаць ноты з мелодыяй *Пінскай шляхты*[749]. Чарговым выдавецкім гатункам, які цікавіў кіраўніка БНКТЛ, з'яўлялася народная творчасць. На працягу 1932–1934 гг. ён планаваў надрукаваць некалькі зборнікаў беларускага фальклору[750]. У 1932 г. К. Езавітаў

---

[743] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 155–156 lpp., Праца Беларускага навукова-краязнаўчага гуртка ў Рызе (пры Т-ве беларусаў – выбаршчыкаў, 19 жніўня 1928 г.

[744] К. Езавітаў, *Да вучыцялеу беларускіх школ і беларускіх арганізацыяу у Латвіі*, "Голас беларуса" 1926, № 18 ад 25 жніўня, с. 1.

[745] *Беларускае жыцьцё у Латвіі*, "Голас беларуса" 1926, № 3 ад 20 красавіка, с. 3; К. Езавітаў, *Да беларускіх настаунікау, артыстау, пісьменьнікау, мастакоу і фатографау у Латвіі*, "Голас беларуса" 1926, № 4 ад 1 траўня, с. 2.

[746] LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 97 lp.

[747] LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 83 lp.

[748] LCVA, f. 368, ap. 1, b. 33, l. 40.

[749] А. Вабішчэвіч, *"Але ж шлях да свабоды старонка праложа!"* [у:] *Сыны і пасынкі Беларусі*, рэд. С. Барыс, Менск 1996, с. 337.

[750] LVVA, 2067 f., 1 ap., 364 l., 276 lp.

збіраўся выдаць камедыю Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча *Сялянка*, але праз матэрыяльныя цяжкасці ад гэтай задумы, як і ад згаданых вышэй, давялося адмовіцца[751]. Адначасова вялася падрыхтоўка да друку прац Баляслава Брэжгі *Ахова помнікаў старажытнасці на Віцебшчыне* і Міколы Вяршыніна *Продкі беларусаў і славянства*. Працу Б. Брэжгі спачатку планавалі перакласці з рускай на беларускую мову (перакладчык: Г. Нікіфароўская) і надрукаваць у часопісе "Беларуская школа ў Латвіі". Беручы пад увагу навуковы ўзровень даследавання, было вырашана выдаць яе ў выглядзе паўнавартай брашуры. Адпаведная ўхвала праўлення БНКТЛ была прынятая 9 верасня 1932 г. З дапамогай працы М. Вяршыніна К. Езавітаў збіраўся аспрэчыць погляды латышскіх даследчыкаў, якія прыпісвалі латвійскім беларусам балцкі радавод[752]. 17 лістапада 1932 г. К. Езавітаў прапанаваў С. Сахараву даслаць рукапіс беларускіх народных спеваў з мэтай іх выдання. Перад гэтым С. Сахараў звярнуўся ў Культурны фонд Латвіі, але не атрымаў грошай на выданне. У сувязі з гэтым К. Езавітаў прапанаваў выдаць працу ўласнымі сіламі[753]. Гэтым задумам таксама не было дадзена ажыццявіцца.

Кнігі выдаваліся і коштам аўтараў. У 1932 г. у Рызе выйшаў паэтычны зборнік В. Вайцюлевіч *Вершы. Dzejas*, выдадзены за яе ўласныя сродкі. Гэта было двухмоўнае выданне: тэксты друкаваліся па-беларуску (лацінкай) і па-латышску. Зборнік складаўся з твораў, прысвечаных Я. Райнісу, 10-м угодкам абвяшчэння незалежнасці Латвіі і інш.[754]

Табліца 33. Спіс беларускіх выданняў у Латвіі ў міжваенны час

Беларускае выдавецтва ў Латвіі
Кастусь Езавітаў, *Беларуская Школа. Першая пасьля лемантара кніга для чытаньня*, Рыга 1926. – 154 с.
Кастусь Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, Рыга 1927.
Статут Т-ва беларускіх вучыцялёў у Латвіі: [зацьверджаны 2 верасьня 1925 г.], Рыга 1927. – 30 с.
Язэп Лёсік, *Наша крыніца: чытаньне для беларускіх школ у Латвіі*, Выд. 3-е, стэрэатыпнае, з асобнымі дадаткамі, зробленымі К. Езавітавым і прыпасованымі да патрэбаў латвійскіх школ, Рыга 1927. – 275 с.
Антон Луцкевіч, *Як вучыць у новай школе*, Рыга 1927. – 48 с.
К. А. Пажытноў, *Папулярныя вочаркі па тэорыі кааперацыі*, Рыга 1927. – 87 с. Пераклад з рускай мовы

[751] *Хроніка беларускага жыцьця ў Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, 1(11), с. 160.

[752] LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 87 lp.

[753] LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 97 lp.

[754] А. Чарняўскі, *Выдавецкая дзейнасць беларускай нацыянальнай меншасці ў міжваеннай латвіі (1918–1940 гг.)*, "Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Серыя 1. Гісторыя і археалогія. Філасофія. Паліталогія" 2023, т. 15, № 3, с. 62.

Пятро Сакол, *На сьвітаньні: першы зборнік вершаў*, Рыга 1929. – 71 с.
К.Езавітаў, *Беларусь у мінулым і сучасным: канспект пазашкольнаму працаўніку для лекцыяў з чароўным ліхтаром*, Рыга 1929.
Matilde Jezovitova, *Vecā baltkrievu kultūra un literatura*, Rīga: Baltkrievu izdevniecība Latvijā 1929. – 29 lpp.
Matildes Jezovitovas, *Īss jaunās baltkrievu literaturas pārskats*, Rīga: Baltkrievu izdevniecība 1929. – 15 lpp.
Кастусь Езавітаў, *Беларускае культурна-асьветнае т-ва Бацькаўшчына ў Латвіі*, Рыга 1932. – 24 с.
Кастусь Езавітаў, *Беларусы ў Літве*, Рыга 1932. – 16 с.
Кастусь Езавітаў, *Дзесяць год Беларускае Школы ў Латвіі 1921–1931*, Рыга 1932.
Францішак Аляхновіч, *У лясным гушчары: казка ў 1 акце: для дзяцей малодшага веку*, Рыга 1932. – 14 с.
Віктар Вальтар, *Ляснікова сена: апавяданьне*, Рыга 1932. – 14 с.
Змітро Даўгяла, *Літоўская мэтрыка і яе каштоўнасьць для вывучэньня мінуўшчыны Беларусі*, Рыга 1933. – 13 с.
Андрэй Упіт, *Фракеец Кілон: апавяданьне*, Рыга 1933. – 15 с. (пераклад з латышскай мовы).
Кастусь Езавітаў, *Беларускае культурна-асьветнае т-ва "Бацькаўшчына" ў Латвіі*, Рыга 1932. – 24 с.
Праграма зьбіраньня вуснае народнае творчасьці, Рыга 1933. – 14 с.
Сцяпан Сіцько, *Дзесяцігодзьдзе 1-ае Рыскае Беларускае асноўнае школы (1923–1933)*, Рыга 1934. – 15 с.
Выдавецтва Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў
Статут Т-ва беларусаў-выбаршчыкаў у Дзяржаўны Сойм, гарадскія, павятовыя і валасныя самаўрады ў Латвіі, Рыга 1925. – 14 с.
Праграма Т-ва беларусаў-выбаршчыкаў у Дзяржаўны Сойм, гарадскія, павятовыя і валасныя самаўрады ў Латвіі, Рыга 1925. – 4 с.
Беларускі працэс у Латвіі 1925, Рыга 1926. – 78 с. (Бібліятэка беларуса-выбаршчыка; № 11)
Першы крок: зборнік вершаў гуртка маладых беларускіх паэтаў у Латвіі, Рыга 1926. – 85 с. (Бібліятэка беларуса-выбаршчыка; № 12)
Ал. Галынец, *Вялікае апрашчэньне, ці вялікае ўдасканаленьне?: (з цыкла "Штодзённыя думкі")*, Рыга 1926. – 44 с. (Бібліятэка беларуса-выбаршчыка; № 13)
Кастусь Езавітаў, *Бярыцеся ўсе за навукова-дасьледчую працу*, Рыга 1926. – 15 с. (Бібліятэка беларуса-выбаршчыка; № 14)
Інструкцыя для працы аддзелаў Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў, Рыга 1926. – 14 с. (Бібліятэка беларуса-выбаршчыка; № 15)
Міністэрства асветы Латвіі
Зорка: першая навука чытання і пісання для беларускіх дзетак, злажыла Аляксандра Смоліч, Рыга: Выданьне Беларускага аддзела пры Міністэрстве прасветы Латвіі 1922. – 60 с.
Праграмы Беларускае Пачатковае Школы у Латвіі, Рыга 1925. – 87 с.
Програма па гісторыі Латвіі для беларускіх пачатковых школ, Рыга: Выданьне Беларускага Аддзелу пры Міністэрстве Асьветы ў Латвіі, 1926. – 14 с.
Праграма краязнаўства для беларускіх пачатковых школ, Рыга 1927.
Пігулеўскі, У. *Географія. Курс III кл.*, Рыга. – 104 с.

Уладзімір Пігулеўскі, *Наш край: зборнік краязнаўства*, Рыга 1928.
Кароткая гісторыя Латвіі для беларускіх пачатковых школ, укл.: О. Свэнэ; пераклаў П. Масальскі, Рыга 1933. – 104 с.
Томас Э., Навасёлаў Ю., *Географія для пачатковых школ*, пераклаў П. Масальскі, Рыга: Izglītības ministrija, 1933. – 152 с.
Беларускае навукова-краязнаўчае таварыства ў Латвіі
Статут Беларускага навукова-краязнаўчага таварыства ў Латвіі, Рыга 1932. – 14 с.
Праграма зьбіраньня вуснае народнае творчасьці, Рыга 1933. – 15 с.
Беларускія дзяржаўныя гімназіі
Ластаўка: зборнік вучнёўскіх твораў Дзяржаўнай Люцынскай Беларускай Гімназіі у Латвіі: за 1923–1924 вучэбны год, укл.: К. Езавітаў, Лудза: Выданьне гімназіі 1924. – 32 с.
Гістарычны нарыс пяцігодздзя Дзьвінскай дзяржаўнай беларускай гімназіі за 1922–1927 г.г., укл.: С. Сахараў, Даўгаўпілс 1927. – 47 с.
Іншыя
Статут Рыжскага Беларускага Прасьветнага Таварыства "Беларуская хата", Рыга: Рыжскага Беларускага Прасьветнага Таварыства "Беларуская хата" 1925.
Беларускі каляндар 1928, Рыга: Выданне Беларускага прасветнага кааператыва "Культура і праца" 1928. – 71 с.
Вольга Сахарава, *На Полацкім замчышчы: казачная фэерыя ў 2 дзеях з пралёгамі*, Даўгаўпілс, 1928. – 16 с.
Вольга Сахарава, *Птушка на волі: п'еса ў 3-х дзеях*, Даўгаўпілс 1928.
Праграма і статут. Партыя Латвійскіх незалежных соцыялістаў, Рыга: Выданьне партыі Латвійскіх незалежных соцыялістаў 1928. – 14 с.
Статут Беларускай дэмакратычнай партыі ў Латвіі, Даўгаўпілс 1931. – 19 с.
В. Вайцюлевіч, *Вершы. Dzejas*, Рыга 1932.
Беларускі каляндар 1937, укл.: С. Сахараў, Даўгаўпілс: A. Oša izdevniecība 1936. – 64 с.
Беларускае таварыства ў Латвіі
Сяргей Сахараў, Народная творчасць латгальскіх і ілукстэнскіх беларусаў, Rīgā: Latvijas baltkrievu biedrības izdevums 1940. – 164 с.
На латышскай мове
K. Jezovītovs, *Par baltkrieviem un lielkrieviem Latvijā*, Rīgā (Izglītības Ministrijas Mēnešraksts; № 1) 1923.

Крыніца: уласныя падлікі аўтара.

Падсумоўваючы гісторыю беларускай кнігавыдавецкай працы ў Латвіі, належыць падкрэсліць, што галоўную працу па падрыхтоўцы і рэалізацыі выдавецкай дзейнасці ажыццяўляў К. Езавітаў. Менавіта ён стварыў Беларускае выдавецтва ў Латвіі, ініцыяваў выдавецкія крокі Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў і Беларускага навукова-краязнаўчага таварыства ў Латвіі. Ён жа быў аўтарам шэрагу кніг і брашур, якія выйшлі па-беларуску ў Латвіі ў той час. Апрача таго, К. Езавітаў адказваў за выдавецкі працэс, рэдагаваў і складаў прадмовы да кніг іншых аўтараў. А таксама займаўся распаўсюдам –

прычым не толькі мясцовых беларускіх выданняў, але і прадукцыі іншых выдавецтваў. Напрыклад, ён пашыраў кнігі, атрыманыя з БССР. У прыватнасці, серыю "Сялянская бібліятэка". У яе ўваходзілі працы па сельскай гаспадарцы і ветэрынарыі (І. Цвікевіч *Як усцерагчыся ад сыфілісу*, П.Н. Штэйнберг *Чым і як угноіваць гарод, калі гною і мэнэральных тукаў не хапае*, Н. Фурс *Сухоты і барацьба з імі*, І. Серада *Сьвіньня – скарбніца гаспадара*, І. Серада *Першая дапамога хворай жывёле*, Я. Грабоўскі *Аб насеньні, як і чым палепшыць насеньне* і інш.). 20 лютага 1927 г. БВЛ перадало ў распараджэнне БША 43 кнігі з вышэйзгаданай серыі[755]. 15 траўня 1930 г. кіраўнік БВЛ звярнуўся ў Беларускі школьны аддзел з прапановай набыць частку атрыманай літаратуры, каб разаслаць па беларускіх школах і бібліятэках[756]. Апрача ўласнай выдавецкай прадукцыі на складзе БВЛ былі кнігі М. Гарэцкага, Я. Лёсіка, В. Ластоўскага, А. Луцкевіча, С. Некрашэвіча і М. Байкова і інш. Кіраўнік БВЛ прапанаваў БША набыць іх на патрэбы беларускіх школ. Камплект з 45 невялікіх кніжачак каштаваў 17 лат[757]. Характарызуючы кнігавыдавецкую дзейнасць у міжваеннай Латвіі, Аляксандр Чарняўскі заўважае, што сярод выданняў практычна адсутнічае духоўная літаратура, што можна тлумачыць канфесійнай стракатасцю беларусаў, нерэлігійнасцю і левымі поглядамі мясцовых лідараў[758].

Праз адсутнасць дастатковай колькасці сродкаў, беларуская выдавецкая дзейнасць у Латвіі была абмежаваная. Пошук грошай на выданне быў адным з галоўных заняткаў мясцовага беларускага актыву. Кнігавыдавецкая дзейнасць фінансавалася ў асноўным за грамадскія складкі і ахвяраванні. Толькі ў выпадку выдавецтваў БША гэта былі дзяржаўныя датацыі. Іншыя арганізацыі нярэдка мусілі дзеля кнігавыдання ахвяраваць іншымі патрэбамі. Напрыклад, цэнтральная ўправа Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў адмовілася ад офіснага памяшкання ў Рызе, каб ашчадзіць грошы на выдавецкую дзейнасць. Нельга выключыць, што на некаторыя выдавецкія праекты К. Езавітаву ўдалося атрымаць падтрымку з-за мяжы, у тым ліку – з Савецкай Беларусі. Асабліва гэта тычыцца друкаванай прадукцыі Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў, якое нейкі час з ідэйных меркаванняў падтрымліваў Менск (гл. наступны раздзел). Аднак сродкаў не хапала, каб разгарнуць паўнавартую выдавецкую працу. І ўсё ж, нягледзячы на цяжкасці, беларуская выдавецкая справа ў Латвіі існавала. Сярод выданняў

---

[755] LVVA, 2125 f., 5 ap., 85 l., 4 lp.

[756] LVVA, 2125 f., 5 ap., 330 l., 48, 49 lpp.

[757] LVVA, 2067 f., 1 ap., 364 l., 276 lp.

[758] А. Чарняўскі, *Выдавецкая дзейнасць беларускай нацыянальнай меншасці ў міжваеннай латвіі (1918–1940 гг.)*, "Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Серыя 1. Гісторыя і археалогія. Філасофія. Паліталогія" 2023, т. 15, № 3, с. 66.

дамінавалі працы навучальнай, навуковай і літаратурнай тэматыкі, што, на думку аўтараў і выдаўцоў, адпавядала патрэбам беларускага нацыянальнага руху ў Латвійскай Рэспубліцы.

Адукацыя

Беларускі школьны аддзел і інспектар беларускіх школ

Завяршэнне беларускага працэса апраўдальным прысудам дало беларускаму нацыянальнаму актыву імпульс да адбудовы беларускай школьнай аўтаноміі. Цяжар гэтай працы ўзялі на сябе культурна-асветныя арганізацыі і настаўніцтва[759]. 6 траўня 1925 г. управа таварыства "Рунь" прыняла рашэнне звярнуцца да латвійскіх улад з просьбай прызначыць кіраўніком БША К. Езавітава. Абгрунтоўваючы просьбу кіраўніцтва таварыства даводзіла, што гэты дзеяч з'яўляўся піянерам беларускага нацыянальнага адраджэння ў Латвіі і яго лёс знітаваны з культурна-асветнай працай беларускай меншасці[760]. 16 траўня 1925 г. у Рызе ўправа таварыства "Беларуская хата" звярнулася да міністра асветы з прапановай аднавіць дзейнасць БША і прызначыць на пасаду кіраўніка К. Езавітава[761]. 18 траўня 1925 г. управа таварыства "Рунь" прыняла падобны зварот, у якім сцвярджалася, што беларускія культурна-асветныя сілы павінны аб'яднацца вакол аднаго цэнтра – Беларускага школьнага аддзела на чале з К. Езавітавым, які зрабіў найбольш для беларускай нацыянальна-культурнай справы ў Латвіі[762].

25 траўня 1925 г. у Даўгаўпілсе адбыўся сход беларускіх настаўнікаў горада і павета (прэзідыум: старшыня С. Сахараў, сябры: М. Талерка, Ф. Астроўскі, А. Махноўскі), на якім прысутнічалі А. Якубецкі, М. Фёдарава, В. Дзяргач, Я. Камаржынскі, С. Красневіч, К. Александровіч, Л. Габран, Р. Плыгаўка, У. Раткін, С. Салаўёва, М. Каспяровіч і інш. Прысутныя слухалі даклад М. Дзямідава, які адзначыў, што з моманту спынення працы БША школьная справа апынулася ў стане стагнацыі: сувязі паміж кіраўніком Агульнага школьнага дэпартамента П. Залітысам і беларускімі школамі амаль спынілася (так, колькасць афіцыйнай карэспандэнцыі паміж кіраўніцтвам і школамі зменшылася амаль у пяць разоў), пагоршылася якасць навучання,

---

[759] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1007 l., 33 lp.

[760] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1007 l., 41 lp.

[761] У дакумеце адзначалася, што таварыства свядома раней устрымлівалася ад просьбы пра рэактывацыю БША да моманту сканчэння суда над беларускім дзеячамі. Апраўдальны прысуд умацаваў іх у перакананні, што прыспеў час, каб аддзел зноў мог працаваць. LVVA, 1632 f., 2 apr., 493 l., 85 lp.

[762] LVVA, 1632 f., 2 apr., 493 l., 83–84 lpp.

вучні перасталі наведваць школы, сярод насельніцтва шырацца чуткі, што беларусам быць не варта, бо іх пераслед будзе працягвацца[763].

У выніку на сходзе была ўхваленая рэзалюцыя, у якой чытаем: "*Дзеля таго, што з моманту перадачы спраў Беларускага аддзела пад кіраўніцтва Галоўнага школьнага ўпраўлення нацыянальнае кіраўніцтва беларускай школы ў Латвіі зусім спынілася, што дало і дае магчымасць варожым элементам беларускага нацыянальнага культурнага адраджэння вясьці безадказнае знішчэнне беларускай нацыянальнай школы; што з моманту прыняцця Галоўным школьным упраўленнем спраў Беларускага аддзела, фактычна перастаў існаваць сам Беларускі аддзел (...) у той час як другія меншасці карыстаюцца сваёй культурна-нацыянальнай аўтаноміяй, што з'яўляецца крыўдным для беларускага нацыянальнага пачуцця і нарушэннем яго культурна-нацыянальных правоў, Беларускае вучыцельства м. Дзвінска і Даўгаўпілскага павета аднагалосна пастанавіла: звярнуць увагу Латвійскага ўрада на падобную ненармальнасць становішча беларускіх школ у Латвіі і прасіць, як найхутчэй вазстанавіць аддзел з кіраўніком-беларусам на чале*"[764]. Удзельнікі падтрымалі прапанову сталічнага актыву, каб кіраўніком адроджанага аддзела стаў К. Езавітаў. Удзельнікі схода адзначылі, што больш адпаведнага кандыдата на пасаду не бачаць, паколькі менавіта ён "*пры сучасным становішчы беларускіх школ і культурнай справы ў Латвіі можа вывесці справу на шлях здаровае і моцнае працы для карысці беларускага грамадзянства і Латвійскае дзяржавы*"[765]. Акрамя таго, прысутныя лічылі неабходным стварыць настаўніцкія курсы ў Даўгаўпілсе, склікаць у Даўгаўпілсе 20–21 чэрвеня 1925 г. беларускую канферэнцыю дзеля абмеркавання стану і перспектыў развіцця беларускай справы ў Латвіі[766]. Услед за даўгаўпілскімі дзеячамі і іх калегі з Лудзеншчыны 26 траўня 1925 г. склікалі сход сяброў Лудзенскага аддзела таварыства "Бацькаўшчына", на якім быў ухвалены зварот да Міністэрства асветы з прапановай адрадзіць працу БША на чале з К. Езавітавым[767].

Захады беларускага актыву выклікалі супрацьдзеянне часткі прадстаўнікоў Кураторыі асветы Латгаліі. 8 чэрвеня 1925 г. з'явілася іх петыцыя ў справе беларускіх школ, аўтары якога лічылі, што Беларускі школьны аддзел звабліваў у беларускія школы вучняў розных нацыянальнасцей (прапануючы ім матэрыяльную дапамогу), каб такім чынам штучна павялічыць іх колькасць. У якасці прыкладу падавалася Лудза, дзе на той час існавала беларуская гімназія (45 вучняў) і пачатковая школа (88 вучняў). На думку супрацоўнікаў

---

[763] М. Каліна, *Зьезд вучыцялеу-беларусау у Дзьвінску*, "Голас беларуса" 1925, № 1, с. 2.

[764] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 112, л. 4; LVVA, 1632 f., 2 apr., 493 l., 59 lp.

[765] LVVA, 2125 f., 5 ap., 9 l., 18 lp.

[766] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 112, л. 2–3.

[767] LVVA, 1632 f., 2 ap., 493 l., 60 lp.

Кураторыі агульная колькасць вучняў і іх родных складала 150 чал., у той час як паводле перапісу насельніцтва ў горадзе жылі толькі 62 беларусы. Такім чынам, рабілася выснова, што больш як палову вучняў складалі запісаныя беларусамі каталікі-латгальцы, пра што сведчылі іх латгальскія прозвішчы. Аўтары мемарыялу сцвярджалі, што лідары беларускага руху ў Латгаліі – гэта былыя русіфікатары (С. Сахараў, Я. Шчорс) і іншаземцы (І. Краскоўскі, А. Якубецкі), якія за грошы замежных дзяржаў вядуць беларускую агітацыю. Асобна адзначалася роля К. Езавітава, які, паводле аўтараў, атрымаў з ЗША 1 тыс. даляраў на сваю працу. У дакуменце падкрэслівалася, што латгальская вёска ў нацыянальным сэнсе "цёмная" і несвядомая, што дае магчымасць нацыянальным (беларускім, рускім, польскім) агітатарам праводзіць прапаганду. Кастусь Езавітаў, адзначалі аўтары, пераконвае сялян, што яны беларусы, потым да іх прыязджае лідар Рускай народна-працоўнай партыі Пётр Карэцкі, які гаворыць ім, што яны "латгальскія рускія", а польскія дзеячы намагаюцца рабіць з іх палякаў, бо мясцовая гаворка ўтрымлівае шмат паланізмаў. Аўтары петыцыі сцвярджалі, што ў гэтай сітуацыі латвійская дзяржава павінна праводзіць больш рашучую палітыку ў дачыненні да латгальскіх славянафонаў. Аўтары выступалі катэгарычна супраць аднаўлення дзейнасці Беларускага школьнага аддзела і сцвярджалі, што ён павінен быць расфарміраваны назаўсёды. Акрамя таго, яны лічылі, што лёс БША мусяць падзяліць школьныя аддзелы іншых нацыянальнасцей, а ў крайнім выпадку можна пакінуць толькі тры з іх: рускі, нямецкі і габрэйскі[768].

Захады нядобразычліўцаў беларускай справы не далі вынікаў. Тым часам, беларусы пачалі больш інтэнсіўна патрабаваць адраджэння БША. 20 ліпеня 1925 г. дэлегацыя з 10 прадстаўнікоў беларускіх арганізацый (Я. Шчорс, М. Дзямідаў, П. Жэрдзі, А. Махноўскі, К. Езавітаў, С. Красневіч і інш.) перадала прэзідэнту Латвіі мемарандум. На наступны дзень яго копія была ўручаная старшыні Рады міністраў і міністру асветы. У дакуменце даваўся кароткі агляд беларускай культурна-асветнай дзейнасці за перыяд з 1921 па 1925 гг. Аўтары падкрэслівалі, што беларускія школы выхоўвалі моладзь у духу адданасці латвійскай дзяржаве. Потым адзначалі, што, пачынаючы з сакавіка 1923 г., у краіне назіраўся наступ на беларускія школы, што знайшло адлюстраванне ў ліквідацыі інспектарату, а з пачаткам 1924 г. – беларусы адчулі адкрыты пераслед, які скончыўся ў 1925 г. высылкай з краіны беларускіх настаўнікаў-іншаземцаў. Аўтары дакумента сцвярджалі, што судовы працэс выклікаў з'яўленне чутак пра новыя арышты і працэсы пад беларусамі. Яны патрабавалі: спыніць ціск на беларускую меншасць; завяршыць спробы МУС зладзіць новыя працэсы над беларускімі дзеячамі; узнавіць працу Беларускага школьнага аддзела; вярнуць на пасады беларускіх

[768] LVVA, 1632 f., 2 apr., 493 l., 36–40 lpp.

настаўнікаў, якія ў час следства былі адхіленыя ад працы і якіх суд апраўдаў; адмяніць рашэнне пра ліквідацыю Лудзенскай беларускай гімназіі. Пад мемарандумам падпісаліся: ад імя таварыства "Рунь" – Я. Шчорс і Н. Пінская, ад таварыства "Беларуская хата" – М. Дзямідаў і К. Мяжэцкі, ад Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў – К. Езавітаў, Р. Плыгаўка, У. Раткін, С. Красневіч, ад беларускага настаўніцтва – Я. Хруцкі і А. Мекш[769].

10 снежня 1925 г. у Даўгаўпілсе прайшла аб'яднаная нарада прадстаўнікоў беларускіх арганізацый, у якой узялі ўдзел С. Сахараў, У. Райкін і К. Александровіч (аддзел Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў), У. Радкін, А. Якубецкі, А. Якубецкая (аддзел таварыства "Беларуская хата"), П. Жэрдзі і І. Фёдараў (аддзел ТБНЛ). Прысутныя абралі прадстаўніка ў сацыяльную камісію Даўгаўпілскай гарадской думы (У. Раткін) і ў школьную ўправу (С. Сахараў). Акрамя таго, было вырашана прасіць школьную ўправу адчыніць вячэрнія курсы для дарослых і дзіцячы садок. Аднак галоўная пастанова тычылася рэактывацыі Беларускага школьнага аддзела. Удзельнікі вырашылі звярнуцца да ўраду Латвіі з просьбай узнавіць дзейнасць установы. Дзеля гэтага прысутныя даручылі К. Езавітаву склікаць агульны сход беларускага актыву, каб той вызначыў кандыдата на кіраўніка. Было таксама вырашана склікаць 3–4 студзеня 1926 г. у Даўгаўпілсе беларускую настаўніцкую канферэнцыю[770]. Невядома, ці гэты заклік быў пачуты беларускім настаўніцтвам, але ўжо ў лютым 1926 г. Таварыства беларускіх настаўнікаў у Латвіі звярнулася да беларускіх культурна-асветных таварыстваў з прапановай зладзіць сход, каб зноў абмеркаваць зварот да ўлады ў справе аднаўлення Беларускага аддзела[771]. 12 лютага 1926 г. Беларускае цэнтральнае пазыкова-ашчаднае таварыства звярнулася да міністра асветы з просьбай аб як мага хутчэй дазволіць узнавіць працу БША[772].

Адначасова са спробамі рэактывацыі Беларускага школьнага аддзела ішла дыскусія наконт яго кіраўніка. Як ужо адзначалася, многія жадалі бачыць на гэтай пасадзе К. Езавітава. Гэта пацвердзілі і вынікі настаўніцкай канферэнцыі, якая адбылася 28–29 снежня 1925 г., удзельнікі якой падтрымалі кандыдатуру К. Езавітава. З гэтым пагадзіліся і беларускія даўгаўпілскія арганізацыі – ТБНЛ, таварыства "Беларуская хата" і Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў[773]. Аднак латвійскі ўрад адмоўна паставіўся да ідэі.

---

[769] *Зачыненьне Люцынскае Беларускае гімназіі*, "Голас беларуса" 1925, № 6 ад 24 ліпеня, с. 3; LVVA, 2750 f., 1 ap., 7 l., 1–2 lpp.; LVVA, 1826 f., 1 ap., 1004 l., 154 lp.

[770] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 93, л. 4.

[771] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1004 l., 142 lp.

[772] *Справа аб аднаўленьню Беларускага Аддзелу пры Міністэрстве Прасьветы*, "Гаспадар" 1926, № 1, с. 4–5.

[773] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1004 l., 142 lp.

У характарыстыцы старшага школьнага інспектара ад 28 траўня 1925 г. адзначалася, што К. Езавітаў не можа займаць пасады кіраўніка БША з наступных прычын: 1) адсутнасць універсітэцкай адукацыі, 2) кепскае адміністраванне падчас кіравання Лудзенскай гімназіяй, 3) палітычная дзейнасць[774].

Ведаючы, што яго намінацыя можа запаволіць атрыманне згоды ўрада на аднаўленне Беларускага школьнага аддзела, К. Езавітаў прасіў беларускія арганізацыі адмовіцца ад яго кандыдатуры[775]. Нягледзячы на гэта, 6 сакавіка 1926 г. ТБНЛ і таварыства "Беларуская хата" пацвердзілі намер падтрымаць кандыдатуру К. Езавітава. Тым часам таварыства "Рунь" і Беларускае цэнтральнае ашчадна-пазыковае таварыства падтрымалі кандыдатуру Р. Плыгаўкі[776]. 25 сакавіка 1926 г. на 2-м аб'яднаным пасяджэнні даўгаўпілскіх беларускіх арганізацый У. Раткін прапанаваў адмовіцца ад кандыдатуры К. Езавітава на карысць іншага кандыдата. Следам А. Якубецкі прапанаваў не адмаўляцца ад К. Езавітава, але накіраваць дэлегацыю да міністра асветы і патлумачыць, што ў выпадку канчатковай адмовы ўрада ад гэтай кандыдатуры яны прапануюць іншую – С. Сахарава. Урэшце ўдзельнікі мерапрыемства падтрымалі П. Жэрдзі, які прапанаваў склікаць 30 сакавіка ў Рызе нараду з удзелам прадстаўнікоў Даўгаўпілшчыны і Лудзеншчыны, удзельнікі якой павінны былі ўзгадніць агульнага кандыдата на пасаду кіраўніка БША[777]. У сувязі з самаадводам К. Езавітава беларускі актыў разглядаў кандыдатуры У. Пігулеўскага, Р. Плыгаўкі, А. Родзькі і С. Сахарава[778]. Аднак у хуткім часе С. Сахараў зняўся, бо лічыў сябе "псіхалагічна неадпаведным да ролі адміністратара"[779].

Пытанне кандыдата на пасаду кіраўніка БША абмяркоўвалася падчас з'езда Даўгаўпілскага аддзела ТБНЛ 3 красавіка 1926 г. у Даўгаўпілсе[780]. 19–20 чэрвеня 1926 г. у Рызе адбыўся сход прадстаўнікоў беларускіх

---

[774] LVVA, 1632 f., 2 ap., 493 l., 62 lp.

[775] У лістападзе 1925 г. К. Езавітаў пісаў у лісце праўленню таварыства "Рунь": "*У пачатку лета гэтага года Вы выставілі маю кандыдатуру на пасаду кіраўніка Беларускага аддзела. Я даў сваю згоду на гэта толькі таму, што сярод беларусаў ішла шкодная для нас барацьба паміж гр. Сахаравым і гр. Пігулеўскім за кіраваннем Беларускім аддзелам, а абодва яны згаджаліся сваё змаганне спыніць і падтрымаць маю кандыдатуру, калі я згаджуся яе выставіць. Прайшло некалькі месяцаў. Урад маю кандыдатуру не зацвярджае. І, відаць па ўсім, не зацвердзіць. Далейшае чаканне шкодна адбіваецца на нашых справах. А таму я здымаю катэгарычна сваю кандыдатуру і прашу выставіць новую*". LVVA, 1826 f., 1 ap., 1004 l., 210 lp.

[776] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 93, л. 1.

[777] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 93, л. 6.

[778] Вучыцель, *Становішча Беларускага Аддзелу пры Міністэрстве Асьветы у Латвіі*, "Голас беларуса" 1926, № 3 ад 20 красавіка, с. 2.

[779] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1004 l., 210 lp.

[780] *Сход беларускіх вучыцялёў Дзьвінскага павету і м. Дзьвінску*, "Школьнае жыцьцё" 1926, № 2, с. 22.

арганізацый[781], удзельнікі якога на прапанову сакратара К. Езавітава падтрымалі кандыдатуру У. Пігулеўскага[782]. Прысутныя зацвердзілі склад дэлегацыі да міністра асветы, у якую ўвайшлі Я. Шчорс, М. Дзямідаў, П. Жэрдзі, К. Езавітаў, А. Махноўскі і С. Красневіч[783]. 25 чэрвеня 1926 г. яны звярнуліся да міністра асветы з просьбай узнавіць працу Беларускага школьнага аддзела і прызначыць на пасаду яго кіраўніка У. Пігулеўскага. Пад зваротам падпісалася кіраўніцтва таварыстваў "Рунь" і "Беларуская хата", ТБНЛ, Беларускага цэнтральнага ашчадна-пазыковага таварыства, Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў, Даўгаўпілскай беларускай гімназіі, прадстаўнікі рыжскага (А. Родзька), даўгаўпілскага (А. Махноўскі) і лудзенскага (В. Руднікаў) беларускага настаўніцтва[784].

Улады Латвіі ўсведамлялі, што зацягванне пытання пра ўзнаўленне БША можа абурыць беларусаў і даць падставы меркаваць, што латвійскі ўрад іх дыскрымінуе[785]. Невыпадкова, у гэты час у беларускай прэсе з'явілася інфармацыя, што латвійскія правыя сілы збіраюцца змяніць школьнае заканадаўства, абмежаваўшы аўтаномію нацменаў[786]. Каб аспрэчыць антыўрадавыя чуткі, 7 ліпеня міністр асветы накіраваў у Раду міністраў запыт пра рэактывацыю Беларускага школьнага аддзела. 28 ліпеня 1926 г. Рада міністраў пастанавіла ўзнавіць БША (з 1 жніўня)[787]. 10 жніўня 1926 г. Міністэрства асветы зрабіла выснову, што праца БША ў папярэднія гады была нездавальняючай. Улады чакалі, што новы аддзел выправіць хібы ў функцыянаванні школ. На думку ўрадоўцаў БША мусіў звярнуць большую ўвагу на нагляд за школамі інспектуючы кожную не радзей як раз на год[788].

У рэальнасці Беларускі школьны аддзел узнавіў працу 16 жніўня 1926 г. Замест прапанаванага беларускай дэлегацыяй У. Пігулеўскага часовым выканаўцам абавязкаў кіраўніка быў прызначаны Р. Плыгаўка, прадстаўнік

---

[781] На сходзе прысутнічалі: П. Жэрдзі – ад ТБНЛ, К. Езавітаў – ад ТБВ, Я. Шчорс – ад таварыства "Рунь", М. Дзямідаў – ад таварыства "Беларуская хата", А. Махноўскі – ад Даўгаўпілскага аддзела ТБВ і настаўніцтва Даўгаўпілшчыны, Ф. Астроўскі – ад Даўгаўпілскага аддзела таварыства "Беларуская хата", С. Сахараў – ад Даўгаўпілскага аддзела Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў, С. Маціеўскі – ад настаўніцтва Лудзеншчыны, Р. Плыгаўка – ад рыжскага настаўніцтва.

[782] *Аб Беларускім Аддзелі пры Міністэрстве Асьветы*, "Голас беларуса" 1926, № 10 ад 1 ліпеня, с. 1; *Рыжская нарада прадстаўнікоў беларускіх арганізацый*, "Голас беларуса" 1926, № 11 ад 7 ліпеня, с. 1; *Беларускае жыцьцё у Латвіі*, "Голас беларуса" 1926, № 17 ад 18 жніўня, с. 4.

[783] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 134, л. 22.

[784] LVVA, 1632 f., 2 ap., 495 l., 67 lp.

[785] LVVA, 2067 f., 1 ap., 364 l., 80 lp.

[786] Адраджэнец, *Замах на нацыянальна-культурную аўтаномію меншасьцяў у Латвіі*, "Голас беларуса" 1926, № 4 ад 1 траўня, с. 1.

[787] *Беларускае жыцьцё у Латвіі*, "Голас беларуса" 1926, № 15 ад 4 жніўня, с. 2.

[788] LVVA, 1632 f., 2 ap., 495 l., 5 lp.

рыжскіх беларусаў[789]. Адсутнасць сталага кіраўніка БША не задавальняла беларускіх актывістаў. Сітуацыя нявызначанасці падагравала супярэчнасці ў асяроддзі беларускага актыву. 20 кастрычніка 1926 г. да міністра асветы звярнулася група дзеячаў на чале з прадстаўніком кіраўніцтва Беларускага цэнтральнага пазыкова-ашчаднага таварыства Я. Тэтарам. Яна прапанавала на пасаду кіраўніка БША кандыдатуру Я. Шчорса. Аўтары звароту падкрэслівалі, што ў выпадку зацвярджэння К. Езавітава або У. Плыгаўкі Беларускі школьны аддзел апынецца ў руках людзей "левых поглядаў". У дакуменце адзначалася, што аддзел не працуе так, як належыць, таму неабходна як мага хутчэй зацвердзіць кіраўніка і дарадчы орган пры ім у выглядзе Рады[790]. Напрыканцы снежня 1926 г. беларускія арганізацыі звярнуліся да міністра асветы з просьбай прызначыць кіраўніка аддзела У. Пігулеўскага, кандыдатура якога раней была адхіленая ўладамі. 18 студзеня 1927 г. Рада міністраў задаволіла гэтую просьбу, і 21 студзеня У. Пігулеўскі быў прызначаны кіраўніком Беларускага школьнага аддзела[791]. 30 студзеня 1927 г. ён паехаў у першае службовае падарожжа ў Даўгаўпілс, дзе ў гімназіі ў яго гонар быў зладжаны банкет[792]. Новы кіраўнік рашуча ўзяўся за працу. На першым пасяджэнні Рады БША пад яго кіраўніцтвам – 16 ліпеня 1927 г. – ён выказаў думку, што беларуская культурна-асветная праца ў Латвіі дасюль не мае добра распрацаванага плану. Старшыня прапанаваў пачаць з пашырэння школьнай справы ў сталіцы: адкрыцця новых школ, у тым ліку гімназіі[793].

Акрамя кіраўніка, у склад Беларускага школьнага аддзела ўвайшлі справавод і машыністка. На пасаду справавода быў прызначаны С. Красневіч, а ў кастрычніку 1927 г. яго змяніла Н. Пінская[794]. У кастрычніку 1926 г. кіраўнік Беларускага школьнага аддзела звяртаў увагу на тое, што ў 3-асабовым складзе аддзел можа выконваць толькі адміністрацыйныя функцыі, але не ў стане эфектыўна кантраляваць школы. Напрыклад, у час адсутнасці кіраўніка не было нікога, хто б мог выконваць яго функцыі[795]. У сувязі з гэтым кіраўніцтва БША звярнулася да ўраду з просьбай павялічыць аддзел да 4 супрацоўнікаў або рэарганізаваць[796].

---

[789] LVVA, 2067 f., 1 ap., 364 l., 48 lp.

[790] LVVA, 1632 f., 2 apr., 493 l., 4–5 lpp.; *Тэтараўшчына*, "Голас беларуса" 1926, № 26 ад 10 лістапада, с. 2.

[791] У. Пігулеўскі, *Беларускі Аддзел пры Міністэрстве Асьветы ў Латвіі за 10 год працы* [у:] *Дзесяць год Беларускае Школы ў Латвіі 1921–1931*, Рыга 1932, с. 30; *Беларускае жыцьцё у Латвіі*, "Голас беларуса" 1927, № 2 ад 19 студзеня, с. 4.

[792] *Беларускае жыцьцё у Латвіі*, "Голас беларуса" 1927, № 4 ад 16 лютага, с. 4.

[793] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 35 lp.

[794] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 45 lp.

[795] LVVA, 1632 f., 2 ap., 495 l., 5 lp.

[796] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 31 lp.

Мясцовы беларускі актыў спадзяваўся, што з адраджэннем БША палепшыцца становішча беларускіх школ. Кастусь Езавітаў лічыў, што найпершай задачай органа мае быць вяртанне страчаных раней беларускіх школ. Ён сцвярджаў, што латвійскае заканадаўства дае беларускай меншасці права на культурную аўтаномію, якой трэба карыстацца. У адным з артыкулаў дзеяч пісаў: "*Падняць прасвету сярод беларускае меншасці ў Латвіі можна. – Усе патрэбныя даныя для гэтага ёсць. Мы маемо правы на свае нацыянальныя школы і належныя для іх утрымання сродкі; маемо і сваіх вучыцялёў і свае вучыцельскія курсы для падрыхтоўкі новых вучыцялёў для новых школ, калі гэткія будуць адчыняцца. Здавалася бы, усё стаіць добра. Між тым лік беларускіх школ у Латвіі не павялічваецца, а памяншаецца. У чым жа тутака справа? А справа ў тым, што 'мець права' – гэта адно, а 'ўмець выкарыстаць гэта права' – гэта другое! І вось у нас ёсць правы, але выкарыстаць гэтыя правы, дзякуючы нашай вялікай непісьменнасці і малой энергіі, мы не ўмеем*"[797].

Беларускі школьны аддзел па-ранейшаму прадстаўляў інтарэсы беларускай меншасці ў культурных і асветных справах і ў зносінах з дзяржаўнымі ўстановамі. З гэтай мэтай ён супрацоўнічаў з латвійскімі і замежнымі палітычнымі і навуковымі асяродкамі. З траўня 1930 г. Рада БША адгукнулася на заклік Рыжскага аддзела Лігі нацый і падрыхтавала звесткі пра беларусаў Латвіі[798]. У гэтым жа годзе Беларускі школьны аддзел падрыхтаваў агляд становішча беларускай меншасці ў Латвіі на патрэбы Этнапалітычнага архіва пры Інстытуце памежжа і замежжа ў Берліне[799].

Разам з аднаўленнем Беларускага школьнага аддзела ўзнавіла працу яго Рада. У яе склад мусіў уваходзіць кіраўнік і шэсць асоб з правам вырашальнага голасу: тры прадстаўнікі беларускага настаўніцтва (абіраліся ўсімі настаўнікамі беларускіх школ шляхам дасылання сваіх галасоў у БША) і па адным – ад таварыстваў "Беларуская хата", "Прасвета" і "Рунь". Іншыя беларускія культурна-асветныя арганізацыі маглі дэлегаваць у Раду прадстаўнікоў, але з правам дарадчага голасу[800]. Першае пасяджэнне адроджанай Рады БША адбылося 19–20 жніўня 1926 г.[801]. Быў абраны яе часовы склад: Р. Плыгаўка (часовы кіраўнік БША), К. Езавітаў (Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў), М. Дзямідаў (таварыства "Беларуская хата"), Я. Тэтар (БЦПАТ), Я. Шчорс (таварыства "Рунь"), С. Маціеўскі (настаўніцтва Лудзеншчыны), П. Жэрдзі

---

[797] К. Езавітаў, *Як падняць прасьвету сярод беларускага жыхарства і умацаваць беларускую школу у Латвіі*, "Голас беларуса" 1926, № 26 ад 10 лістапада, с. 1.

[798] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 15 lp.

[799] LVVA, 2125 f., 5 ap., 85 l., 152–153 lpp.

[800] *Трэба інфармаваць аб сабе суседзяў*, "Голас беларуса" 1926, № 16 ад 11 жніўня, с. 4.

[801] *Беларускае жыцьцё ў Латвіі*, "Голас беларуса" 1926, № 34 ад 11 жніўня, с. 4.

(настаўніцтва Даўгаўпілшчыны), С. Сахараў (Даўгаўпілская беларуская гімназія). На прапанову Р. Плыгаўкі і К. Езавітава ўдзельнікі прынялі рэзалюцыю, павітаўшы "справядлівы крок латвійскага ўрада на шляху аднаўлення нармальнай чыннасці Беларускага аддзела" і выказалі ўпэўненасць, што "латвійскі ўрад задаволіць і далейшыя справядлівыя пажаданні беларускае меншасці"[802]. Апрача таго, прысутныя вырашылі да часу канчатковага афармлення Рады, у адпаведнасці з пастановай нарады беларускіх арганізацый ад 19 чэрвеня 1926 г. і прапановай часовага кіраўніка Р. Плыгаўкі, прыняць на сябе абавязкі Часовай Рады БША. Удзельнікі прынялі (галасамі 5 – за, 2 – супраць, 1 – устрымаўся) прапанову К. Езавітава аб тым, каб у склад Рады ўваходзілі 3 прадстаўнікі настаўніцтва ад беларускіх настаўніцкіх арганізацый[803].

На практыцы гэта азначала, што кандыдаты ад настаўніцтва дэлегаваліся ў Раду кіраўніцтвам ТБНЛ. Напрыклад, 26 верасня 1926 г. на сходзе ўправы ТБНЛ былі дэлегаваныя С. Махноўскі (ад даўгаўпілскага настаўніцтва), С. Маціеўскі (ад лудзенскага настаўніцтва) і К. Езавітаў (ад праўлення)[804]. У чарговым пасяджэнні Рады 28 кастрычніка 1926 г. узялі ўдзел Р. Плыгаўка, К. Езавітаў (ТБНЛ), А. Махноўскі (настаўніцтва Даўгаўпілшчыны), С. Красневіч (настаўніцтва Лудзеншчыны), Я. Шчорс ("Рунь"), П. Жэрдзі ("Прасвета"), Дзямідаў ("Беларуская хата") і С. Сахараў (Даўгаўпілская беларуская гімназія)[805]. Склад Рады змяняўся штогод, паколькі арганізацыі абіралі новых прадстаўнікоў. У 1926/27 гг. у яе ўваходзілі: У. Пігулеўскі (старшыня), К. Езавітаў (ТБНЛ), С. Маціеўскі (настаўніцтва Лудзеншчыны), М. Дзямідаў ("Беларуская хата"), Н. Пінская ("Рунь"), П. Жэрдзі ("Прасвета")[806].

5 сакавіка 1927 г. пры Радзе быў створаны Суд гонару, статут якога распрацавалі К. Езавітаў, М. Дзямідаў і С. Сахараў. Гэты орган павінен быў займацца разглядам спрэчных спраў і канфліктаў паміж настаўнікамі[807].

Пасяджэнні Рады БША адбываліся ў залежнасці ад колькасці спраў. У перыяд са жніўня 1926 па красавік 1934 г. адбылося 38 пасяджэнняў, у сярэднім 3–4 разы на год (з выключэннем – 1934 – 2 разы, а таксама 1927 і 1928 гг. – адпаведна 6 і 9 разоў). Склад апошняй Рады БША быў абраны ўвесну 1933 г.: У. Пігулеўскі (старшыня), М. Дзямідаў (таварыства "Беларуская хата"), Я. Кастылюк (таварыства "Прасвета"), Н. Пінская (таварыства "Рунь") і тры прадстаўнікі настаўніцтва: У. Езавітаў, У. Раткін і К. Мяжэцкі[808].

---

802 LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 30 lp.

803 LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 30 lp.

804 LVVA, 2125 f., 5 ap., 80 l., 4 lp.

805 LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 32 lp.

806 LVVA, 2125 f., 5 ap., 10 l., 20 lp.

807 LVVA, f. 2125, apr. 5, l. 4, 36 lp.

808 *У Радзе Беларускага Аддзелу пры Міністэрстве Асьветы*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 5(22), с. 328.

У кампетэнцыю Рады Беларускага школьнага аддзела ўваходзіў разгляд спраў звязаных з адукацыяй. На яе пасяджэннях абмяркоўваўся і прымаўся гадавы бюджэт на беларускія школы, вырашаліся справы, звязаныя з адкрыццём новых школ, прафесійнай дысцыплінай, кадравымі пытаннямі, персанальнымі справамі настаўнікаў, матэрыяльнымі патрэбамі. Істотным элементам працы Рады было размеркаванне фінансавання. Гэты орган адказваў за падзел сродкаў на патрэбы не толькі школ, але і беларускіх культурна-асветных арганізацый. На практыцы на матэрыяльную падтрымку маглі разлічваць перадусім таварыствы, якія мелі сваіх прадстаўнікоў у Радзе. У архіве БША захаваліся дакументы, якія дазваляюць падрабязна прасачыць механізм падзелу грошай. Напрыклад, 5 чэрвеня 1930 г. М. Дзямідаў падкрэсліваў важнасць падтрымкі таварыства "Беларуская хата", якое ён прадстаўляў у Радзе. Свой пастулат беларускі дзеяч абгрунтоўваў тым, што таварыства мела аддзелы ў Рызе, Ліепаі і Даўгаўпілсе, рупілася пра адкрыццё беларускай школы ў Ліепаі. Ён патрабаваў, каб Беларускі школьны аддзел прызначыў 1 тыс. латаў на далейшую працу арганізацыі[809]. Тым часам П. Журкоўскі падкрэсліваў поспехі ТБМЛ і хваліўся, што яно мела 12 аддзелаў. У сувязі з гэтым ён прасіў 2 тыс. латаў на патрэбы сваёй арганізацыі. Прадстаўнік таварыства "Прасвета" П. Жэрдзі сцвярджаў, што яго арганізацыя мае 8 аддзелаў на Пустыншчыне і Прыдруйшчыне. На тое, каб пашырыць працу на Ілукшчыну, ён прасіў 1 тыс. латаў. У выніку гадавыя сродкі былі размеркаваныя наступным чынам: ТБМЛ атрымала 1 500 латаў, "Беларуская хата" і "Прасвета" – па 750[810]. Тым часам, на пасяджэнні Рады Беларускага школьнага аддзела 16 ліпеня 1931 г. падзел сродкаў (10 тыс. латаў) выглядаў наступным чынам: на культурна-асветную працу беларускіх арганізацый – 2,5 тыс. (800 – ТБМЛ, 600 – таварыству "Прасвета", 600 – таварыству "Беларуская хата", 500 – на адкрыццё новых беларускіх школ); 5,5 тыс. – на дапамогу школам (1380 – школе пры Рыжскіх беларускіх настаўніцкіх курсах, 800 – на дзіцячыя пляцоўкі пры 1-й і 2-й Рыжскіх беларускіх школах, 1000 – Гараўскай прыватнай школе, 300 – Прыдруйскай школе на інтэрнат, 120 – Даўгаўпілскай школе на інтэрнат, 400 – на падручнікі для пачатковых школ, 1,5 тыс. – на дапамогу бедным вучням)[811].

Паколькі ад рашэнняў Рады БША залежалі датацыі на дзейнасць культурна-асветных таварыстваў, апошнія імкнуліся займець прадстаўніка ў Радзе. Напрыклад, 6 снежня 1932 г. управа ТБМЛ звярнулася да кіраўніцтва

---

[809] LVVA, 2125 f., 5 ap., 90 l., 9 lp. Раней фінансавая інспекцыя ў 1929 г. выявіла шэраг парушэнняў з боку М. Дзямідава, які не прадставіў звестак пра частку сродкаў атрыманых з Беларускага аддзела. НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 134, л. 22.

[810] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 17 lp.

[811] *Карэспандэнцыі*, "Думка беларуса" 1931, № 3, с. 2.

Беларускага школьнага аддзела з прапановай вылучыць арганізацыі адно месца. Гэта абгрунтоўвалася тым, што ТБМЛ з'яўляецца найбольш актыўнай і жыццядзейнай беларускай арганізацыяй у Латвіі[812]. 22 траўня 1933 г. Рада БША задаволіла просьбу ТБМЛ[813].

Удзел у працы Рады не прадугледжваў нацыянальных абмежаванняў. Аднак дадзенае пытанне было прадметам дыскусіі. 1 кастрычніка 1927 г. старшыня ўправы ТБНЛ К. Езавітаў звярнуў увагу на неабходнасць таго, каб у склад Рады БША абіраліся толькі беларусы[814]. Яго заява была скіраваная супраць украінца П. Жэрдзі, які ў Радзе прадстаўляў таварыства "Рунь". Праўда, аўтар звароту адзначаў, што асабіста не мае нічога супраць П. Жэрдзі, але хацеў бы, каб беларускія пытанні вырашалі беларусы. Супраць гэтай прапановы К. Езавітава выступіў У. Пігулеўскі, заявіўшы, што гатовы адмовіцца ад абавязкаў кіраўніка Беларускага школьнага аддзела, паколькі яго пазіцыя не знаходзіць разумення ў сяброў Рады[815]. Нягледзячы на гэта, 2 кастрычніка Рада ўсё ж забараніла прадстаўнікам іншых нацыянальнасцей удзельнічаць у яе працы: "*каб беларускія таварыствы, выбіраючы прадстаўнікоў у Раду беларускага аддзела, абавязкова выбіралі дзеячаў, якія з'яўляюцца па нацыянальнасці беларусамі*"[816]. Пратэст супраць пастановы выказала кіраўніцтва таварыства "Рунь" (Я. Шчорс, Л. Тэтар, Н. Пінская, Л. Клагіш). На пасяджэнні 10 кастрычніка яно прыняло адпаведную заяву, падкрэсліваючы, што вузка нацыяналістычны прынцып з'яўляецца

---

[812] LVVA, 2125 f., 5 ap., 13 l., 42 lp.

[813] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 85 lp.

[814] У лісце кіраўніцтву БША ён пісаў: "*Грамадзяніну кіраўніку Беларускага аддзела (Для далучэння да пратакола сходу Рады Беларускага аддзела ад 1 кастрычніка 1927 года). На сходзе Рады Беларускага аддзела 1-га кастрычніка 1927 года мной было паднята пытанне аб тым, каб беларускія таварыствы, дэлегуючыя прадстаўнікоў у склад Рады Беларускага аддзела, дэлегавалі туды абавязкова беларусаў. Прапазіцыю гэтую я ўнёс, кіруючыся жаданнем, папярэдзіць на будучыню дэзарганізацыю беларускага нацыянальна-культурнага жыцця ў Латвіі праз умяшальніцтва ў працу Беларускага аддзела і ягонай Рады усялякіх старонніх элементаў, якія іншы раз уваходзяць у беларускія таварыствы, прыкідваючыся прыхільнікамі беларускага адраджэння, а потым праводзяць лінію працы на раскол беларускага грамадзянства. Прапазіцыя мая была прынятая большасцю Рады аддзела і таму з'яўляецца ўжо стаўшымся фактам. Аднак, дзеля таго, што ў Радзе Беларускага аддзела былі два галасы супраць маёй прапазіцыі, а таксама таму, што кіраўнік Беларускага аддзела падняў нават пытанне аб сваёй адстаўцы, якой я не дамагаўся і якую лічу ў даны момант надзвычайна шкоднаю для беларускае меншасці ў Латвіі, – я згаджаюся на тое, каб гэтая прапазіцыя была накіравана беларускім арганізацыям для абгаворвання, бо не жадаю, каб прынятая пастанова выклікала замяшацельства ў беларускай культурна-асветнай працы. К. Езавітаў, старшыня Цэнтральнага Праўленьня Т-ва*". LVVA, 2125 f., 5 ap., 80 l., 2 lp.

[815] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 49 lp.

[816] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1004 l., 103 lp.

недапушчальным. Дзеячы таварыства "Рунь" лічылі, што Беларускі школьны аддзел мае характар нацыянальнага прадстаўніцтва, але калі сярод сяброў беларускіх арганізацый ёсць небеларусы з паходжання, якія актыўна працуюць на карысць беларускай асветнай справы, дык ім варта аказаць пашану. Пры гэтым прыводзіўся прыклад шведа Густава Цэльяда, які паказаў сябе як здольны і адданы справе настаўнік Даўгаўпілскай беларускай гімназіі[817].

16 верасня 1930 г. Міністэрства асветы зацвердзіла інструкцыю, якая прадугледжвала змены ў працэсе выбараў сяброў Рады БША. Згодна з дакументам, прадстаўнікі ад настаўніцтва абіраліся настаўніцкімі калектывамі беларускіх асноўных, сярэдніх і прафесійных школ і камплектаў. Для выбараў склікалася камісія пад старшынствам кіраўніка БША ў складзе інспектара і сябра ўправы ТБНЛ. Настаўніцтва магло накіраваць у Раду трох прадстаўнікоў – па адным з Рыгі, Даўгаўпілшчыны ды Ілукшчыны, Лудзеншчыны і Рэжыччыны[818]. Першыя выбары паводле новай сістэмы адбыліся 15 снежня 1930 г., калі падліковая камісія (У. Пігулеўскі, П. Журкоўскі, С. Сіцько) сцвердзіла, што ў Раду былі абраныя С. Сахараў, У. Раткін і С. Казека[819]. У 1932/33 гг. інтарэсы настаўніцтва прадстаўлялі К. Езавітаў (атрымаў 33 галасы), С. Сахараў (24 галасы) і У. Раткін (17 галасоў)[820]. 14 красавіка 1934 г. адбыліся апошнія выбары прадстаўнікоў беларускага настаўніцтва ў Раду БША, на якіх перамаглі: К. Езавітаў (28 галасоў), У. Раткін (24) і К. Мяжэцкі (20). Многія настаўнікі не ўдзельнічалі ў выбарах: падчас выбараў увесну 1934 г. было разаслана 70 анкет, на якія адказала толькі 47 чал. Такім чынам, няўдзел склаў ажно 33% настаўнікаў. Найбольшую выбарчую пасіўнасць прадэманстравалі педагогі з правінцыі. На Даўгаўпілшчыне прагаласавала толькі 9 з 20, тым часам як у Даўгаўпілсе – 10 з 16, а ў Рызе – прагаласавалі ўсе (33)[821].

Істотнай падзеяй у справе рэактывацыі кіроўных органаў беларускай школьнай справы было аднаўленне пасады інспектара беларускіх пачатковых школ. Адбылося гэта 31 сакавіка 1928 г. На пасяджэнні Рады БША 1 красавіка 1928 г. было абмеркавана пытанне кандыдатуры. Частка прысутных бачыла на гэтай пасадзе К. Езавітава. Яго падтрымалі прадстаўнікі беларускага настаўніцтва Даўгаўпілшчыны (Д. Казлоўскі) і Лудзеншчыны (С. Маціеўскі), а таксама – таварыства "Беларуская хата" (М. Дзямідаў). Аднак кіраўнік Беларускага школьнага аддзела У. Пігулеўскі прапанаваў разгледзець яшчэ адну кандыдатуру на выпадак, калі Міністэрства асветы адмовіцца

---

817 LVVA, 2125 f., 5 ap., 10 l., 37 lp.; LVVA, 1826 f., 1 ap., 1004 l., 100 lp.

818 НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 107, л. 52; LVVA, 2125 f., 5 ap., 75 l., 173 lp.

819 LVVA, 2125 f., 5 ap., 12 l., 16 lp.

820 *Хроніка беларускага жыцьця ў Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, 1(11), с. 160.

821 LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 100 lp.

зацвярджаць К. Езавітава. Прысутныя ж вырашылі, што ў такім выпадку Рада БША збярэцца яшчэ раз і абмяркуе новую кандыдатуру. У выніку патаемнага галасавання, у якім не браў удзелу К. Езавітаў, яго падтрымала большасць: 5 галасоў – за, 1 – устрымаўся[822].

Перасцярогі У. Пігулеўскага былі небеспадстаўнымі: Міністэрства асветы адмовілася зацвердзіць К. Езавітава на пасадзе інспектара. Пра гэта сябрам Рады БША стала вядома 29 красавіка 1928 г. Рашэнне латвійскіх улад было вынікам недаверу да К. Езавітава, які лічыўся палітычна нядобранадзейным[823]. Рада Беларускага школьнага аддзела мусіла склікаць новае пасяджэнне. Разглядаліся тры кандыдатуры на пасаду інспектара – Р. Плыгаўка, Я. Кастылюк і А. Дварэцкі. Паколькі першы зняў сваю кандыдатуру, быў абраны Я. Кастылюк. Гэтым разам прапанова беларусаў не выклікала супраціву з боку міністэрства[824]. 3 ліпеня 1928 г. міністр асветы зацвердзіў Я. Кастылюка на пасадзе інспектара беларускіх школ[825]. 9 ліпеня 1928 г. на пасяджэнні Рады БША У. Пігулеўскі паінфармаваў прысутных пра гэта прызначэнне[826]. Інспектар прыступіў да выканання абавязкаў 27 ліпеня 1928 г., калі яму была перададзеная канцылярыя[827]. Такім чынам, у сярэдзіне 1928 г. беларуская школьная справа ў Латвіі набыла арганізацыйны кшталт, які мела ў першыя гады існавання.

У траўні 1930 г., падчас пасяджэння Рады БША, Я. Кастылюк папрасіў вызваліць яго ад абавязкаў інспектара і прызначыць настаўнікам у адну са школ[828]. 5 чэрвеня 1930 г. Рада БША даручыла часовае выкананне абавязкаў інспектара П. Журкоўскаму[829]. Частка беларускага актыву (Даўгаўпілскі аддзел ТБНЛ) аспрэчыла гэтае рашэнне, вінавацячы рыжан у тым, што яны не лічацца з меркаваннем беларускай супольнасці ў правінцыі. У сувязі з гэтым, 30 ліпеня 1930 г. Рада Беларускага школьнага аддзела яшчэ раз правяла выбары, у якіх П. Журкоўскі перамог М. Дзямідава. У хуткім часе Міністэрства асветы зацвердзіла П. Журкоўскага на пасадзе інспектара беларускіх пачатковых школ[830]. Супраць кандыдатуры П. Журкоўскага выступала

---

[822] *Сход Рады Беларускага Аддзелу пры Міністэрстве Асьветы*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1928, № 8(1), с. 117–118; LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 60 lp.

[823] Яскрава сведчыць пра гэта факт, што ў 1928 г. міністэрства адхіліла кандыдатуру К. Езавітава на пасаду кіраўніка Рыжскіх дзяржаўных беларускіх настаўніцкіх курсаў. LVVA, f. 2125, ap. 5, 4 l., 79 lp.

[824] LVVA, 2125 f., 5 ap., 84 l., 3, 4 lpp.

[825] LVVA, f. 2924, apr. 1, l. 81, 31 lp.

[826] *Беларускае жыцьцё ў Латвіі*, "Голас беларуса" 1928, № 59 ад 10 ліпеня, с. 4.

[827] LVVA, 2125 f., 5 ap., 84 l., 14 lp.

[828] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 14 lp.

[829] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 20 lp.

[830] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 21 lp.

частка настаўніцтва Лудзеншчыны[831]. Нягледзячы на гэта, ён займаў пасаду інспектара да 1 студзеня 1932 г., калі школьныя інспектараты нацыянальных меншасцей былі скасаваныя.

На працы Беларускага школьнага аддзела і яго Рады адмоўна адбіваліся ўнутраныя канфлікты. Асабліва варта адзначыць напружаныя адносіны паміж кіраўніком БША і К. Езавітавым. Яны мелі палітычныя разыходжанні, якая абвастрыліся ў перыяд парламенцкай кампаніі 1928 г. (гл. раздзел IV). Аднак гэта быў толькі адзін з элементаў шматгадовых асабістых супярэчнасцей, якія з часам ператварыліся ў адкрытую варажнечу. Рада Беларускага школьнага аддзела была пляцоўкай, дзе сутыкаліся апаненты. На пасяджэннях неаднаразова даходзіла да вострых палемік. Падчас адной з іх К. Езавітаў пакінуў пасяджэнне, абгрунтоўваючы свой учынак тым, што кіраўнік БША вінаваціць яго ў хлусні[832]. Пасля ў тлумачальнай запісцы К. Езавітаў адзначаў, што У. Пігулеўскі ўвесь час перапыняў яго прамову сваімі рэплікамі, а потым прапанаваў пакінуць пасяджэнне[833]. На пасяджэнні Рады БША 3 лістапада 1928 г. паміж імі зноў адбылася сварка. Справа тычылася настаўніцы М. Каспяровіч, якую У. Пігулеўскі вінаваціў у амаральных паводзінах і патрабаваў звольніць. Тым часам, К. Езавітаў як кіраўнік ТБНЛ правёў "уласнае следства" і ўзяўся бараніць педагога. Але прысутныя пагадзіліся з У. Пігулеўскім, палічыўшы аргументы К. Езавітава неаб'ектыўнымі[834].

Напрыканцы 1920-х гг. сярод настаўніцтва пачала расці незадаволенасць дзейнасцю У. Пігулеўскага на пасадзе кіраўніка Беларускага школьнага аддзела. Спрэчкі выклікаў факт, што, пачынаючы з 1928 г., ён спалучаў пасаду з дзейнасцю дэпутата Сойма (гл. раздзел IV). Частка беларускага настаўніцкага актыву не бачылі ў гэтым нічога кепскага. 3 лістапада 1928 г. Рада БША прыняла пастанову, адзначаючы, што прысутнасць У. Пігулеўскага ў парламенце карыснае і неабходнае для беларускай працы[835].

Аднак не ўсе падзялялі такі погляд. Асобы, якія патрабавалі адклікання У. Пігулеўскага, лічылі, што ён не можа прадуктыўна працаваць на карысць беларускай школьнай справы, быўшы адначасова дэпутатам Сойма і кіраўніком Беларускага школьнага аддзела. Ініцыятары адклікання У. Пігулеўскага з пасады кіраўніка БША спасылаліся на заяву, якую ён сам зрабіў 29 сакавіка 1929 г. падчас канферэнцыі беларускіх арганізацый. Дзеяч тады падкрэсліў, што перагружаны працай у Сойме і не можа належным чынам выконваць

---

[831] *Выпіска з пратаколу нарады беларускіх вучыцялёў Люцынскага павету 23 жніўня 1930 г.*, "Шлях праўды" 1930, 24 X, с. 3.

[832] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 96 lp.

[833] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 97 lp.

[834] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 84–85 lpp.

[835] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 79 lp.

абавязкаў кіраўніка Беларускага школьнага аддзела. 8 снежня 1929 г. управа таварыства "Беларуская хата" прыняла рэзалюцыю, прапанаваўшы У. Пігулеўскаму падаць у адстаўку з адначасовай прапановай С. Сахарава на яго месца. Рэзалюцыю падтрымала ўправа ТБНЛ, якая лічыла, што сваёй палітычнай актыўнасцю У. Пігулеўскі можа нашкодзіць беларускай школьнай справе, бо ён як палітык быў звязаны са справамі рускай меншасці. На думку аўтараў, вынікам дзейнасці У. Пігулеўскага стала перадача шэрагу беларускіх школ у Лудзенскім павеце ў распараджэнне Рускага школьнага аддзела (гл. раздзел IV). Дзейнасць У. Пігулеўскага на чале Беларускага школьнага аддзела была прадметам увагі ўдзельнікаў нарад Рыжскага аддзела ТБНЛ, якія адбыліся 21 і 23 снежня 1929 г. Выслухаўшы тлумачэнні У. Пігулеўскага і азнаёміўшыся з аргументамі яго апанентаў, удзельнікі прынялі рашэнне лічыць працу кіраўніка БША нездавальняючай і накіраваць яго справу на далейшы разгляд на месцах[836].

Адстаўка У. Пігулеўскага стала адной з галоўных тэмаў сходаў Даўгаўпілскага аддзела ТБНЛ, якія адбыліся 16 ліпеня, 2 і 7 жніўні 1930 г. Прысутныя вырашылі перадаць міністру асветы мемарандум аб нездавальняючай працы кіраўніка БША[837]. Дзеля гэтага была абраная дэлегацыя беларускіх настаўнікаў (А. Барткевіч, М. Дзямідаў, А. Клагіш, С, Казека, Я. Кудраўцоў). Уладзіміра Пігулеўскага патрабавалі замяніць на іншую асобу, вінавацячы ў палітызацыі асветнай працы і тэрарызаванні настаўніцтва іншых поглядаў. Пры гэтым, у выпадку адмоўнага разгляду просьбы, удзельнікі дэлегацыі пагражалі, што перавядуць свае школы ў Агульны школьны дэпартамент. У адказ на захады сваіх праціўнікаў У. Пігулеўскі звярнуўся да кіраўнікоў пачатковых школ з пытаннем ці яны сапраўды жадаюць перайсці ў Агульны школьны дэпартамент[838]. Тым часам, бок У. Пігулеўскага ўзяло кіраўніцтва таварыства "Араты" (старшыня П. Жэрдзі, намеснік У. Раткін, скарбнік У. Відаўскі), якое 11 жніўня прыняло ўхвалу аб тым, што акцыя супраць У. Пігулеўскага ініцыяваная нешматлікай групкай варожа настаўленых да беларускай справы настаўнікаў. Кіраўнікі таварыства "Араты" лічылі, што адкліканне У. Пігулеўскага з пасады кіраўніка БША будзе "шкодным для беларускай справы ў сучасны момант". На іх думку, подпісы за адкліканне кіраўніка БША збіраліся не на сходах, а "шляхам прыватных угавораў паасобных персон"[839].

---

[836] *Аб кіраўніцтве Беларускім Аддзелам*, "Шлях праўды" 1930, 24 X, с. 1.

[837] *Выпіска з пратаколу агульнага сходу Дзьвінскага аддзелу Т-ва беларускіх вучыцялёў у Латвіі 17 жніўня 1930 году*, "Шлях праўды" 1930, 24 X, с. 2.

[838] LVVA, 2125 f., 5 ap., 87 l., 29 lp.

[839] LVVA, 2125 f., 5 ap., 86 l., lp. 80; LVVA, 1826 f., 1 ap., 1004 l., lp. 60; LVVA, 1747 f., 1 ap., 25 l., 63 lp.

Кульмінацыяй канфлікту стала адкрытая спрэчка паміж прыхільнікамі і апанентамі У. Пігулеўскага падчас пасяджэння Рады БША 15 жніўня 1930 г. Частка прысутных (А. Барткевіч, С. Казека і М. Дзямідаў) пакінула пасяджэнне на знак пратэсту супраць У. Пігулеўскага. Астатнія сябры Рады прынялі заяву, у якой асудзілі дзеянні "ворагаў беларускае школьнае аўтаноміі" і заклікалі "нацыянальна мыслачае" беларускае настаўніцтва выказаць падтрымку У. Пігулеўскаму. Прыхільнікі кіраўніка Беларускага школьнага аддзела асудзілі петыцыю да міністра называючы яе вынікам шкоднай акцыі, што была спланаваная пэўнай палітычнай групоўкай дзеля знішчэння беларускай школьнай аўтаноміі. Яны рашуча выступілі супраць падрыхтоўкі гэтага дакумента без папярэдняга абмеркавання яго на настаўніцкай канферэнцыі і дэкларавалі гатоўнасць змагацца ў будучыні з падобнымі ўчынкамі. Аўтары заявы аспрэчылі абвінавачанні ў "беспадстаўным тэроры" на адрас У. Пігулеўскага[840].

На вышэйзгаданым пасяджэнні Рады БША У. Пігулеўскага падтрымалі прадстаўнікі ўпраў Таварыства беларускіх настаўнікаў у Латвіі (С. Сіцько) і таварыства "Прасвета" (П. Жэрдзі). Гэта выклікала пратэст іншых сяброў абодвух арганізацый, якія выступалі супраць У. Пігулеўскага. У выніку Рыжскі, Даўгаўпілскі і Лудзенскі аддзелы ТБНЛ апратэставалі дзеянні С. Сіцько, а частка ўправы таварыства "Прасвета" разам з кіраўніком А. Дварэцкім не падтрымала П. Жэрдзі[841]. Апаненты У. Пігулеўскага склікалі 17 жніўня 1930 г. сход Даўгаўпілскага аддзела ТБНЛ, дзе на прапанову А. Барткевіча асудзілі заяву Рады БША ў падтрымку У. Пігулеўскага і назвалі яе неправамоцнай. Акрамя таго, удзельнікі схода раскрытыкавалі ўхвалу таварыства "Араты" у абарону У. Пігулеўскага. Паводле А. Клагіша, некаторыя сябры таварыства "Араты" як небеларусы не мелі маральнага права апратэстоўваць адстаўку У. Пігулеўскага[842].

У рэшце рэшт У. Пігулеўскаму ўдалося застацца на пасадзе кіраўніка Беларускага школьнага аддзела. 21 жніўня 1930 г. у Даўгаўпілсе з яго ініцыятывы была склікана беларуская настаўніцкая канферэнцыя, якая скончылася прыняццем пастановы пра аказанне яму даверу. Пры гэтым частка ўдзельнікаў у знак пратэсту перад галасаваннем сышла[843]. 23 жніўня нарада Лудзенскага аддзела ТБНЛ абскардзіла пастанову канферэнцыі, бо ў скліканым У. Пігулеўскім мерапрыемстве не ўдзельнічалі прадстаўнікі беларускага

---

[840] LVVA, 2125 f., 5 ap., 87 l., 25 lp.

[841] *Паседжаньне Рады Беларускага Аддзелу пры Міністэрстве Прасьветы*, "Шлях праўды" 1930, 24 X, с. 2.

[842] *Выпіска з пратаколу агульнага сходу Дзьвінскага аддзелу Т-ва беларускіх вучыцялёў у Латвіі 17 жніўня 1930 году*, "Шлях праўды" 1930, 24 X, с. 3.

[843] *Канфэрэнцыя Беларускага вучыцельства*, "Шлях праўды" 1930, 24 X, с. 3.

настаўніцтва Лудзенскага павета. Удзельнікі нарады адзначалі, што ў склад управы ТБНЛ уваходзяць асобы, пазбаўленыя ўласных поглядаў, якія без пярэчанняў выконваюць загады кіраўніка БША. Удзельнікі нарады пратэставалі супраць дзейнасці кіраўніцтва таварыства і выказвалі вотум недаверу яго сябрам С. Сіцько, П. Журкоўскаму, П. Жэрдзі і Н. Пінскай. Было вырашана даручыць М. Дзямідаву, Я. Кудраўцову і М. Краўчанку скліканне новай канферэнцыі беларускіх настаўнікаў дзеля перавыбараў управы ТБВЛ. Удзельнікі нарады асудзілі паводзіны У. Пігулеўскага, які, на іх думку, абразіў годнасць аднаго з прадстаўнікоў беларускага настаўніцтва[844].

Спрэчка вакол У. Пігулеўскага выйшла далёка за межы беларускага асяродку. Дзеля сваёй абароны ён выкарыстоўваў перыядычны орган рускага аддзела латвійскіх сацыял-дэмакратаў "Трудовая мысль", які сам рэдагаваў. На старонках выдання з'явілася інтэрв'ю з У. Пігулеўскім, у якім ён вінаваціў сваіх апанентаў, сцвярджаючы, што яны занялі неграмадзянскую пазіцыю. У сваю чаргу апаненты У. Пігулеўскага 24 кастрычніка 1930 г. выдалі аднаднёўку "Шлях праўды", на старонках якой вінавацілі кіраўніка БША ў "палітыканстве і нетактоўнасці", якія, на іх думку, вялі справу беларускай меншасці да згубы[845]. Апаненты У. Пігулеўскага закідалі яму кепскае кіраванне справамі беларускай асветы, што прывяло да пасіўнасці і страты нацыянальнай свядомасці настаўніцтва[846]. Ананімны аўтар абвінавачваў кіраўніка Беларускага школьнага аддзела ў заняпадзе беларускага жыцця на Лудзеншчыне тлумачачы, што ён пасварыўся з мясцовымі прыхільнікамі беларушчыны і тым самы адкінуў іх ад беларускага жыцця. У якасць доказу аўтар падаваў лічбы перапісу насельніцтва, паводле якога ў 1925 г. у Істэрскай воласці налічвалася 5 096 беларусаў, а ў 1930 г. – толькі 258[847]. Заслугоўвае ўвагі, што на старонках аднаднёўкі крытыка была скіраваная не толькі ў бок аднаго У. Пігулеўскага, але тычылася і яго прыхільнікаў з таварыства "Прасвета". У артыкуле, прысвечаным гэтай арганізацыі, чытаем: "*Гіблая справа, калі якая-небудзь установа ці таварыства сходзе з грамадскага шляху і служа асабістым інтарэсам*"[848].

Непаразуменне вакол У. Пігулеўскага перарасло ў зацяжны ўнутраны канфлікт у асяроддзі беларускай інтэлігенцыі Латвіі. Ён не згас і праз некалькі гадоў: 20 верасня 1933 г. на пасяджэнні Рады БША адбылася вострая

---

[844] *Выпіска з пратаколу нарады беларускіх вучыцялёў Люцынскага павету 23 жніўня 1930 г.*, "Шлях праўды" 1930, 24 X, с. 3.

[845] Дземенскі, *Адказ гр. Пігулеўскаму на яго інтэрв'ю*, "Шлях праўды" 1930, 24 X, с. 1.

[846] *Трошку аб статыстыцы*, "Шлях праўды" 1930, 24 X, с. 2.

[847] *Чаму беларусы згубілі свае школы ў Істэнскай вол. Люцынскага пав.*, "Шлях праўды" 1930, 24 X, с. 2.

[848] *Троху аб працы беларускага культура-прасьветнага т-ва "Прасьвета"*, "Шлях праўды" 1930, 24 X, с. 2.

спрэчка паміж У. Пігулеўскім і К. Езавітавым, у выніку якой першы выдаліў апошняга з залы. У адказ управа ТБНЛ 22 верасня 1933 г. выдала пратэст, называючы ўчынак У. Пігулеўскага знявагай К. Езавітава і беларускага настаўніцтва, якое ён прадстаўляў у Радзе БША. Аўтары пратэсту выказалі поўны давер да К. Езавітава і жадалі, каб У. Пігулеўскі папрасіў прабачэння[849]. Спробу ўлагодзіць канфлікт зрабіў С. Сахараў, які заклікаў кіраўніка Беларускага школьнага аддзела пагадзіцца з К. Езавітавым[850]. Нягледзячы на вышэйзгаданыя пратэсты, У. Пігулеўскі захаваў пасаду кіраўніка БША ажно да моманту ліквідацыі гэтага органа ў 1934 г. Адной з галоўных прычын трываласці пазіцыі У. Пігулеўскага было прыхільнае стаўленне да яго з боку латвійскіх улад, якія не бачылі лепшага кандыдата на пасаду кіраўніка беларускай школьнай аўтаноміі. Можна выказаць меркаванне, што не апошнюю ролю адыграла грамадска-палітычныя пазіцыя дзеяча, якая забяспечыла яму падтрымку кіроўных сіл краіны (гл. раздзел IV).

Рыжскія дзяржаўныя беларускія настаўніцкія курсы

Разам з узнаўленнем працы Беларускага школьнага аддзела працягнулі дзейнасць 2-гадовыя Рыжскія дзяржаўныя беларускія настаўніцкія курсы. У гэты час была зроблена спроба вяртання курсаў са сталіцы ў правінцыю. 29 кастрычніка 1926 г. Рада БША ўхваліла прапанову перанесці іх у Даўгаўпілс з тае прычыны, што большасць курсантаў паходзіць з Латгаліі, а бюджэт аддзела скараціўся[851]. Аднак урэшце было вырашана пакінуць курсы ў сталіцы,"бліжэй да галоўнага культурна-палітычнага цэнтра Латвіі"[852]. Але пытанне пераносу курсаў у Латгалію не знікла з павесткі дня. У наступныя гады некаторыя настаўнікі працягвалі выказваць меркаванне аб мэтазгоднасці працы курсаў у Даўгаўпілсе[853]. У 1925/26 гг. курсы

---

[849] У рэзалюцыі чытаем: "*Цэнтральнае праўленне канстатуе: 1) што на паседжанні Рады аддзела кіраўнік Беларускага аддзела ставіўся без належнай пашаны да шэрагу сяброў Рады, што выклікала і раней ужо розныя непаразуменні і інцыдэнты, 2) што на паседжанні Рады аддзела 20.IX.1933 г. кіраўнік Беларускага аддзела гр. Ул. Пігулеўскі адносіўся аднабакова ў стасунку да сябры Рады аддзела К. Езавітава і беспадстаўна выдаліў апошняга з паседжання, 3) беспадстаўнае выдаленне сябра Рады аддзела абражае як самога К. Езавітава як сябру Рады , так і яго выбаршчыкаў г.з. усё беларускае вучыцельства, якое абрала яго прадстаўніком*". LVVA, 2125 f., 5 ap., 13 l., 64–65 lpp.

[850] У лісце С. Сахарава У. Пігулеўскаму чытаем: "*лічу непажаданым выдаленне сябра Рады з пасяджэння. Інцыдэнт паміж Вамі і Езавітавым усебакова належыць разгледзець у Радзе БА і ва імя агульнай беларускай справы ганаровым сябрам яго ліквідаваць*". LVVA, 2125 f., 5 ap., 13 l., 66 lp.

[851] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 33 lp.

[852] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 39 lp.

[853] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 94 lp.

пераехалі ў будынак на Саркандаўгаве, па адрасе Simaņa 14/16. У 1928/29 гг. установа зноў змяніла сядзібу і пераехала ў новае месца па адрасе: *Slokas iela 10*[854].

Пасля аднаўлення Беларускага школьнага аддзела кіраўніцтва курсамі было даручана Р. Плыгаўку. Улетку 1926 г. ён адмовіўся ад пасады, бо не мог спалучаць дзве пасады. 21 жніўня 1926 г. педрада курсаў прыняла яго адстаўку[855]. У верасні 1926 г. Міністэрства асветы адхіліла кандыдатуру М. Дзямідава на пасаду новага кіраўніка курсаў, таму педрада прапанавала на яе У. Пігулеўскага[856]. 29 кастрычніка 1926 г. Часовая Рада БША ўхваліла зварот да міністра асветы з прапановай прызначыць яго кіраўніком курсаў. Да моманту зацвярджэння У. Пігулеўскага прапанавана было прызначыць М. Дзямідава часовым кіраўніком. Міністэрства асветы пагадзілася і 5 лістапада 1926 г. зацвердзіла М. Дзямідава на пасадзе да 1 жніўня 1927 г.[857] У сувязі з прызначэннем, апошні адмовіўся ад дырэктарства ў адной са сталічных школ[858]. Аднак новы кіраўнік не найлепшым чынам зарэкамендаваў сябе. Ад самага пачатку М. Дзямідаў апынуўся ў цэнтры непаразуменняў. 27 лістапада 1926 г. ён інфармаваў БША, што не атрымаў ад свайго папярэдніка ўсіх спраў і маёмасці, таму не нясе адказнасці за няўдачы ў працы курсаў. Новы кіраўнік выключыў некаторых курсантаў, што стала прычынай іх незадаволенасці[859]. Апрача таго, адбыўся інцыдэнт са стратай інвентару ў выніку нядбайства М. Дзямідава[860]. Восенню 1928 г. М. Дзямідаў заявіў пра жаданне скласці абавязкі кіраўніка спасылаючыся на перагружанасць і вялікую адлегласць да працы. 3 лістапада 1928 г. Рада БША прапанавала Я. Шчорса на пасаду новага кіраўніка[861]. 26 траўня 1929 г. Я. Шчорс склаў з сябе абавязкі, а на яго месца Рада БША абрала П. Жэрдзі, які 9 жніўня 1929 г. прыступіў да справы[862].

---

[854] К. Адраджэнец, *Выпускны Акт на Беларусіх Дзяржаўных Вучыцельскіх Курсах*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 3(13), с. 181.

[855] VVA, 6845 f., 2 ap., 13 l., 3 lp.

[856] LVVA, 6845 f., 2 ap., 1 l., 13 lp.

[857] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 34 lp.; LVVA, 6845 f., 2 ap., 13 l., 4 lp.

[858] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 39 lp.

[859] LVVA, 2125 f., 5 ap., 355 l., 33, 40 lpp.

[860] 15 лютага 1933 г. БША звярнуўся да кіраўніка Рыжскай беларускай дадатковай школы для дарослых, у якой настаўнічаў М. Дзямідаў. У лісце чытаем: "*у сувязі з тым, што былы кіраўнік беларускіх педагагічных курсаў і сучасны вучыцель вашай школы М. Дзямідаў, нягледзячы на многаразовыя прапановы ўпраўлення, дагэтуль не ўпарадкаваў справу згубленага на паіменных курсах у час яго кіравання інвентара, Беларускае ўпраўленне просіць вас утрымліваць з пенсіі вучыцеля М. Дзямідава суму гэтага інвентара ў ліку 1250,83 латаў і ўносіць іх у Дзяржаўны банк*". LVVA, 2125 f., 5 ap., 360 l., 108 lp.

[861] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 80 lp.

[862] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 18 lp.; LVVA, 6845 f., 2 ap., 12 l., 1 lp.

15 ліпеня 1927 г. Рада БША з прапановы новага кіраўніка вырашыла ператварыць курсы ў 2-гадовыя[863]. З гэтага часу яны дзейнічалі як Дзяржаўныя беларускія настаўніцкія курсы (*Valsts baltkrievu pedagoģiskie kursi*)[864]. Рэарганізацыя выклікала змены ў праграме курсаў, якія сталі прычынай непаразумення. У 1927 г. у БША і да кіраўніка курсаў звярнулася група выпускнікоў (1924–1926 гг.), якія так і не атрымалі пасады настаўніка II катэгорыі, не здаўшы іспыт па матэматыцы і фізіцы. Курсанты лічылі сябе пакрыўджанымі, паколькі ранейшы кіраўнік абяцаў ім, што атрымаюць званне настаўнікаў, але пасля, калі курсамі кіраваў Р. Плыгаўка, адбыліся змены ў праграме, і матэматыка з фізікай не выкладаліся[865].

У разгляданы час на курсах выкладаліся этыка, латышская мова, гісторыя і геаграфія Латвіі, беларуская мова, гісторыя беларускай літаратуры, псіхалогія, асновы педагогікі і дыдактыкі, методыка навучання роднай мовы, школьная гігіена, музыка, логіка і філасофія, гісторыя педагогікі, гісторыя культуры, методыка выкладання гісторыі, методыка выкладання матэматыкі, методыка выкладання прыродазнаўства, маляванне і чарчэнне, спевы і музыка, агародніцтва і садаўніцтва, практычныя лекцыі ў пачатковай школе, фізічнае выхаванне, грамадазнаўства і іншыя прадметы[866]. Курсанты вывучалі гісторыю Беларусі і беларускую мову па кнігах Б. Тарашкевіча (*Беларуская граматыка для школ*), М. Гарэцкага (*Невялічкі беларуска-маскоўскі слоўнік*, Вільня 1921), У. Ігнатоўскага (*Кароткі нарыс гісторыі Беларусі*) і інш. 10 ліпеня 1926 г. Часовая Рада Беларускага школьнага аддзела падтрымала прапанову М. Дзямідава наконт увядзення ў праграму польскай мовы (як неабавязковага прадмета ў аб'ёме не больш яе 2 гадзін у тыдзень), а таксама пастулат С. Сахарава аб увядзенні лекцый па дашкольным выхаванні, музыцы і земляробстве[867].

Якасць працы курсаў ацэньвалася па-рознаму. Іх кіраўнік Я. Шчорс крытыкаваў навучальную падрыхтоўку і нацыянальнае аблічча[868]. Тым часам К. Езавітаў лічыў працу курсаў недастатковай і малаэфектыўнай. Ён тлумачыў гэта кепскай базавай падрыхтоўкай слухачоў сцвярджаючы, што неабходна рыхтаваць курсантаў па вузкіх спецыяльнасцях паводле нямецкай настаўніцкай школы. Ён таксама лічыў, што пры курсах павінна існаваць паказальная школа[869]. Дзеяч даводзіў, што ў 1925 г. курсы не скончыў аніводзін

[863] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 39 lp.
[864] LVVA, 6845 f., 2 ap., 4 l., 83 lp.
[865] LVVA, 2125 f., 5 ap., 355 l., 55 lp.
[866] LVVA, 1632 f., 2 ap., 495 l., 25 lp.; LVVA, 2125 f., 5 ap., 274 l., 1 lp.
[867] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 31 lp.
[868] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 94 lp.
[869] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 94 lp.

чалавек, а ў 1926 г. толькі 2–3 выпускнікі атрымалі працу ў беларускіх школах. Прычыну заганнай працы ўстановы ён бачыў у адсутнасці матэрыяльнага забеспячэння курсантаў. У зацемцы, прысвечанай становішчу курсаў, ён пісаў: "*У 1925–26 вучэбным годзе стыпендыяты беларускіх вучыцельскіх курсаў у Рызе атрымоўвалі ўсяго 500 рублёў у месяц. Падвозу ад бацькоў не было. Слухачы курсаў, або змушаны былі галадаваць, або шукаць працы. Было і тое, і другое, – і галадавалі, і працавалі дзе папала, на падзённых чорных работах, па 8–10 гадзін у дзень. Стомленыя, галодныя людзі прыхадзілі ўвечары слухаць лекцыі. Увага была кепская. Нервавaліся настаўнікі. Нервовы настрой быў і ў курсантаў. Поспехі не маглі быць добрымі. Прамучыўшыся паўгода палова кінула курсы. Другая палова атрымала ў спадчыну частку іхніх стыпендыяў, аднак было гэтага ўсё яшчэ мала. Мучыліся. Перабіваліся. Працавалі на лесапілках. Калі наблізіліся экзамены, дык дзе-хто зусім не экзаменаваўся, а рэшта экзаменавалася так слаба, што і казаць аб гэтым не варта*"[870].

Крытычнае стаўленне да працы курсаў падзяляў М. Дзямідаў. Яшчэ 2 ліпеня 1924 г., у лісце кіраўніку БША ён звяртаў увагу на адсутнасць на курсах выхаваўчай і нацыянальнай дысцыпліны, парадку ў навучальнай і гаспадарчай галінах. Ён лічыў, што кіраўніцтва курсаў павінна прыкласці максімум намаганняў, каб надаць курсам нацыянальнае аблічча. У прыватнасці, М. Дзямідаў прапаноўваў, каб кіраўніком курсаў была асоба, якая добра ведае беларускую мову і патрабуе ад слухачоў карыстання гэтай мовай. У якасці кіраўнікоў курсаў і школы пры іх М. Дзямідаў бачыў сябе або Я. Шчорса. У выпадку ігнаравання прапановаў ён меў намер звярнуцца да міністра асветы[871].

Дзеяч бачыў наступныя прычыны кепскай працы курсаў. Па-першае, курсанты мусілі на працягу года засвоіць матэрыял, які ў настаўніцкіх інстытутах засвойваўся за 2–3 гады. Па-другое, стыпендыі курсантаў (10 латаў) былі мізэрныя, што прымушала курсантаў падпрацоўваць, занядбаўшы навучанне. Па-трэцяе, кіраўнікі курсаў спалучалі выкананне сваіх абавязкаў з працай у школах, таму не маглі аддаваць шмат часу кіраванню курсамі. На думку М. Дзямідава, у праграму курсаў павінны быць уключаны сучасныя прадметы (гімнастыка, гігіена, фізіялогія), практыкі па прыродазнаўстве, тэатральнай працы і музыцы. Акцэнт мусіў рабіцца на практычнае навучанне (экскурсіі, гутаркі, агляды, канферэнцыі) пры мінімальнай колькасці тэарэтычных заняткаў. Дзеяч прапаноўваў надаваць асаблівую ўвагу прадметам, якія маюць сувязь з Латгаліяй, яе жыццём і ўмовамі (латышская мова, беларусазнаўства). Ён сцвярджаў, што ўсе прадметы, акрамя замежных моваў, маюць выкладаць настаўнікі-беларусы. Ён таксама звяртаў увагу

---

[870] К. Езавітаў, *Дзьве неадкладныя задачы Беларускага Аддзелу*, "Голас беларуса" 1926, № 18 ад 25 жніўня, с. 2–3.

[871] LVVA, 2125 f., 5 ap., 348 l., 155–156 lpp.

на тое, што курсы павінны падрыхтаваць народнага настаўніка, які будзе "*ў вёсцы адзіным інтэлігентным чалавекам, найбліжэй стоячым і беспасярэдня датыкальным да народных масаў. Дзеля гэтага ён павінен быць усебакова развітым і адукаваным, каб на кожны зварот да яго і запытанне, умець даць не толькі адказ, але і разумную і карысную раду*"[872]. У сувязі з гэтым ён лічыў, што курсы мусяць дзейнічаць паводле сцісла акрэсленага статусу і нагадваць прыкладную школу. Каб гэтага дасягнуць, належала прымаць на курсы асоб беларускай нацыянальнасці, якія маюць схільнасць да педагагічнай працы. М. Дзямідаў сцвярджаў, што прыём павінен адбывацца раз на год, а навучанне – доўжыцца з 1 верасня па 31 траўня. З пункту гледжання М. Дзямідава, кіраўнік курсаў мусіў абірацца педрадай, якая павінна таксама аплачваць працу лектараў і кіраўніка інтэрната[873].

Увагі заслугоўвае педагагічны склад курсаў. Ён мяняўся з цягам часу, што дэманструе дадзеная табліца.

Табліца 34. Педагагічны склад Рыжскіх дзяржаўных беларускіх курсаў у 1926–1934 гг.

Лектар	Прадмет
1926/27 гг.	
Рыгор Плыгаўка	матэматыка
Аляксадр Родзька	матэматыка хімія прыродазнаўства
Уладзімір Пігулеўскі	педагогіка
Мікалай Дзямідаў	
Сцяпан Сіцько	геаграфія
петэрыс Петэрсонс	
Аляксандрс Азоліньш	гімнастыка
Павел Сталяроў	спевы
1927/28 гг.	
Уладзімір Пігулеўскі	
Мікалай Дзямідаў	
Рыгор Прыгаўка	
Кастусь Езавітаў	

[872] М. Дзямідаў, *Да арганізацыі Дзяржауных Беларускіх 2-х гадовых вучыцельскіх курсау у Рызе*, "Голас беларуса" 1926, № 10 ад 1 ліпеня, с. 2; Тамсама, № 11 ад 7 ліпеня, с. 2.

[873] М. Дзямідаў, *Да арганізацыі Дзяржауных Беларускіх 2-х гадовых вучыцельскіх курсау у Рызе*, "Голас беларуса" 1926, № 10 ад 1 ліпеня, с. 2; Тамсама, № 11 ад 7 ліпеня, с. 2.

Лектар	Прадмет
Аляксанд Родзька	
Сцяпан Сіцько	
Арнольдс Вевэрбрантс	
Петэрыс Петэрсонс	
Аляксандрс Азоліньш	
1928/29 гг.	
Уладзімір Пігулеўскі	
Ян Шчорс	
Якуб Кастылюк	
Рыгор Плыгаўка	
Сцяпан Сіцько	
Аляксандр Родзька	
Марыя Паўлава	
Арнольдс Вевэрбрантс	
Петэрыс Петэрсонс	
Аляксандрс Азоліньш	
Аляксандрс Пляўнэкс	музыка
Эміль Мачс	тэатральная справа
1929/30 гг.	
Уладзімір Пігулеўскі	методыка навучання роднай мовы
Парфіры Жэрдзі	
Якуб Кастылюк	
Ян Шчорс	
Сцяпан Сіцько	
Аляксандр Родзька	
Мікалай Дзямідаў	
Марыя Паўлава	
Арнольдс Вевэрбрантс	
Аляксандрс Азоліньш	
Петэрыс Петэрсонс	
Марыя Доўгая	
1930/31 гг.	
Уладзімір Пігулеўскі	кааперацыя і грамадскія навукі
Парфіры Жэрдзі	методыка навучання прыродазнаўства геаграфіі гісторыя педагогікі

Лектар	Прадмет
Якуб Кастылюк	методыка навучання гісторыі
Сцяпан Сіцько	гісторыя беларускай літаратуры
Ян Шчорс	этыка каліграфія
Аляксандр Родзька	методыка навучання матэматыкі
Арнольдс Вевэрбрантс	латышская мова
Петэрыс Петэрсонс	
Аляксандрс Азоліньш	фізічная падрыхтоўка
Марыя Паўлава	пісхалогія і педагогіка
Карліс Арэ	дашкольная адукацыя
Мікалай Валогін	гісторыя культуры
Міхаіл Грыўскі	
кс. Анотон Альшэўскі	этыка
1931/32 гг.	
Уладзімір Пігулеўскі	методыка навучання роднай мовы
Парфіры Жэрдзі	педагогіка
Якуб Кастылюк	методыка
Сцяпан Сіцько	беларуская літаратура гісторыя
кс. Антон Альшэўскі	этыка
Марыя Паўлава	псіхалогія педагогіка
Арнольдс Вевэрбрантс	латышская мова
Петэрыс Петэрсонс	методыка малявання
Аляксандрс Азольньш	фізічнае выхаванне
Карліс Арэ	дашкольнае выхаванне
Яніс Рудзіс	грамадазнаўства
1933/34 гг.	
Уладзімір Пігулеўскі	
Парфіры Жэрдзі	
Аляксандр Родзька	
Сцяпан Сіцько	
Сяргей Сахараў	

Лектар	Прадмет
Якуб Кастылюк	
Мікалай Дзямідаў	
Пятро Мірановіч	
Тэкля Шміт	
Карліс Арэ	
Аляксандрс Азоліньш	
Мікеліс Патмальніекс	
Марыя Паўлава	

Крыніца: LVVA, 6845 f., 2 ap., 13 l., 7 lp.; LVVA, 2125 f., 5 ap., 259 l, 55 l.; LVVA, 1632 f., 2 apr., 495 l., 24 lp.; LVVA, 2125 f., 5 ap., 348 l., 114 lp.; LVVA, 6845 f., 2 ap., 13 l., 19 lp.; LVVA, 6845 f., 2 ap., 16 l., 2 lp.; LVVA, 6845 f., 2 ap., 16 l., 7 lp.; LVVA, 6845 f., 2 ap., 12 l., lp. 30, 252; LVVA, 6845 f., 2 ap., 19 l., 7 lp.; LVVA, 6845 f., 2 ap., 12 l., lp. 270; LVVA, 6845 f., 2 ap., 19 l., 105 lp.; LVVA, 1632 f., 2 ap., 499 l., 91 lp.; LVVA, 2125 f., 5 ap., 368 l., 33 lp.; LVVA, 2125 f., 5 ap., 33 l., 3 lp.; *Сьпіс беларускіх школ і настаўніцтва ў Латвіі ў бягучым 1928–29 навучальным годзе,* "Беларуская школа ў Латвіі" 1929, № 9(1), с. 12.

Апрача асоб, пералічаных у табліцы, з курсамі ў асобныя гады супрацоўнічалі Якуб Пільсатнэк, Якабс Вінзарайс і Пётр Башко (гісторыя і геаграфія Латвіі). Паводле нацыянальнага паходжання пераважалі беларусы. Гэта былі настаўнікі беларускіх сталічных школ. Акрамя таго, на курсах працавала некалькі латышоў, украінец (П. Жэрдзі) і руская (М. Паўлава).

Колькасць курсантаў вагалася ў залежнасці ад году.

Табліца 35. Колькасць курсантаў Рыжскіх дзяржаўных беларускіх настаўніцкіх курсаў у 1926–1934 гг.

Навучальны год	Колькасць
1926/27	12
1928/29	22
1929/30	25 (15 на 1-м курсе і 10 – на 2-м)
1930/31	25 (13 на 1-м курсе і 12 – на 2-м)
1931/32	31
1933/34	30 (20 – на 1-м курсе і 10 – на 2-м)

Крыніца: LVVA, f. 6845, apr. 2, l. 19, 1–7 lpp.; LVVA, 6845 f., 2 ap., 12 l., 30, 252 lpp.; LVVA, 6845 f., 2 ap., 19 l., 7 lp.; LVVA, 6845 f., 2 ap., 12 l., 255 lp.; LVVA, 6845 f., 2 ap., 12 l., 608 lp.; LVVA, 6845 f., 2 ap., 20 l., 1–10 lpp.; LVVA, 2125 f., 5 ap., 33 l., 3 lp.

Большасць курсантаў паходзіла з Латгаліі, паколькі галоўнай крыніцай папаўнення курсаў былі выпускнікі Даўгаўпілскай беларускай гімназіі. Пры курсах быў інтэрнат на 26 месцаў, дзе яны маглі жыць падчас навучання[874].

Дысцыпліна навучэнцаў ацэньвалася па-рознаму. Аналіз даступных крыніц дазваляе сцвярджаць, што некаторыя курсанты не вызначаліся добрымі паводзінамі. 20 верасня 1926 г. на пасяджэнні педрады курсаў М. Дзямідаў звярнуў увагу на тое, што некаторыя слухачы "неакуратна" наведваюць лекцыі. Адзін з курсантаў нават заявіў, што ён сам будзе вырашаць, наведваць заняткі ці не. Педрада пастанавіла звярнуць увагу курсантаў на абавязак наведваць заняткі[875]. У снежні 1926 г. у БША звярнуліся курсанты Якуб Воркуль, Антон Лейтан, Альфонс Антаневіч і Антон Радзевіч, якія скардзіліся на тое, што іх адлічылі за "неакуратнае адведванне лекцый". Яны апраўдваліся адсутнасцю на курсах правілаў паводзін. У сувязі з гэтым, БША прасіў кіраўніка курсаў, каб педрада разгледзела магчымасць узнаўлення згаданых асоб[876].

Нягледзячы на складанасці і недахопы, курсы працавалі і небеспадстаўна разглядаліся беларускім актывам як кузня нацыянальнага настаўніцтва. Невыпадкова кіраўніцтва Беларускага школьнага аддзела рупілася, каб як мага большая колькасць настаўнікаў пачатковых школ праслухала курсы. Беларускія дзеячы намагаліся не толькі даць курсантам прафесійныя веды, але і прышчапіць ім пачуццё адказнасці за свой народ. 11 чэрвеня 1928 г. С. Сахараў так вітаў выпускнікоў курсаў: "*Дзвінская дзяржаўная беларуская гімназія шчыра вітае сваіх былых выхаванцаў з паспешным заканчэннем беларускіх вучыцельскіх курсаў. Выхадзіце з бадзёрым настроем пахаць глыбока і шырока беларускую ніву плугом і нясіце ў нашу яшчэ цёмную вёску праменні света, дабра і харастваˮ*[877].

Курсы завяршаліся выніковым іспытам. Захаваліся архіўныя звесткі выпускаў у асобныя гады. Напрыклад, у траўні 1934 г. адбыліся выпускныя іспыты па методыцы навучання матэматыкі (П. Жэрдзі, А. Родзька, К. Арэ), методыцы навучання геаграфіі (П. Жэрдзі, Я. Кастылюк, С. Сахараў), псіхалогіі (П. Жэрдзі, С. Сахараў, М. Паўлава), лацінскай мове (П. Жэрдзі, М. Патмальніекс, Т. Шміт), гісторыі беларускай літаратуры (П. Жэрдзі, С. Сіцько, А. Родзька). 6 чэрвеня адбылася ўрачыстасць уручэння дыпломаў[878].

---

[874] Э. Екабсонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [в:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 59–60.

[875] LVVA, 6845 f., 2 ap., 1 l., 13 lp.

[876] LVVA, 6845 f., 2 ap., 13 l., 10 lp.

[877] LVVA, 2067 f., 1 ap., 365 l., 23 lp.

[878] LVVA, 6845 f., 2 ap., 12 l., 464 lp.

Выпускнікі-курсанты ў межах выніковых іспытаў былі абавязаныя правесці тры ўрокі: па беларускай мове, матэматыцы і прадмеце на выбар. Кваліфікацыйныя ўрокі праводзіліся ў прыкладнай школе пры курсах, якой апекавалася ТБНЛ[879], альбо ў адной са сталічных беларускіх школ[880]. Напрыклад, 17 сакавіка 1930 г. курсантка Вера Хлебнікава правяла ў 1-й беларускай пачатковай школе лекцыю *Як святкуюць святы на Беларусі*[881]. Тым часам, 3 красавіка 1930 г. курсант Аркадзь Рытаў правёў у той жа школе лекцыю па гісторыі па тэме *Аб'яднанне літоўскіх плямён*[882]. 12 траўня 1930 г. курсант Язэп Мяжэцкі правёў там лекцыю па гісторыі на тэму *Люблінская унія 1569 года*. Настаўнік-інспектар адзначаў, што настаўнік узвышаў ролю князя ВКЛ Альгерда як здольнага і разумнага ўладара, а Ягайлу характарызаваў так: "Лянівы і бесхарактарны чалавек, якога не любіў народ, якому ён нічога карыснага даць не мог". У сувязі з гэтым, на думку курсанта, беспаспяховы князь быў вымушаны шукаць шчасця ў Польшчы. Польска-літоўскую унію ён прадставіў як няўдалую і нявыгадную для літоўска-беларускай дзяржавы і лічыў яе наступствам бязладдзя[883].

Працу курсаў ускладняла нястача фінансавання. Беларускі бок неаднаразова прасіў школьныя ўлады падтрымаць курсы. Яшчэ 1 кастрычніка 1927 г. Рада БША вырашыла звярнуцца да міністра асветы з просьбай асігнаваць дадатковыя сродкі на працу курсаў[884]. На пачатку 1930-х гг. бюджэт курсаў быў значна скарочаны. У 1932 г. на іх утрыманне Міністэрства асветы выдаткавала 9 тыс. латаў, а ў 1933 г. – толькі 4 500 (потым павялічыла да 6 500). У 1933 г. курсы адзначылі адзінаццатую гадавіну[885]. Аднак складаная матэрыяльная сітуацыя не давала нагоды для аптымізму. 5 траўня 1933 г. сябры Рады БША (К. Езавітаў, К. Мяжэцкі, М. Дзямідаў, Я. Кастылюк) звярнуліся да кіраўніка Беларускага школьнага аддзела з прапановай як мага хутчэй склікаць

---

[879] У 1930/31 гг. педагагічны склад гэтай школы выглядаў наступным чынам: П. Жэрдзі (кіраўнік), Я. Кастылюк (беларусазнаўства), У. Гусарэвіч (каліграфія і гімнастыка), Аркадзь Рытаў (спевы), Сабіна Мяжэцкая (рэлігія) (LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 10 lp.). 5 лютага 1933 г. кіраўніцтва ТБНЛ крытычна ацаніла працу П. Жэрдзі на пасадзе кіраўніка школы. Апошні лічыў абвінавачанні ў яго бок беспадстаўнымі, таму заявіў аб адстаўцы (LVVA, 6845 f., 2 ap., 12 l., 445 lp.).

[880] LVVA, 2125 f., 5 ap., 360 l., 20 lp.; К. Адраджэнец, *Выпускны Акт на Беларусіх Дзяржаўных Вучыцельскіх Курсах*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 3(13), с. 181.

[881] LVVA, 6845 f., 2 ap., 3 l., 2 lp.

[882] LVVA, 6845 f., 2 ap., 3 l., 20 lp.

[883] LVVA, 6845 f., 2 ap., 3 l., 50–51 lpp.

[884] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 47 lp.

[885] Э. Екабсонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [в:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 59–60.

пасяджэнне Рады, каб абмеркаваць усё горшае становішча курсаў[886]. 22 траўня 1933 г. на пасяджэнні Рады БША К. Езавітаў, кіруючыся жаданнем ашчадзіць выдаткі, прапанаваў скасаваць пасаду кіраўніка курсаў. Удзельнікі таксама абмяркоўвалі магчымасць спыніць запіс новых слухачоў. Аднак было вырашана не адмаўляцца ад набору[887]. Дзеля эканоміі Рада Беларускага школьнага аддзела абавязала кіраўніка здаваць памяшканне курсаў за 60 латаў у месяц, а прыбытак з найму прызначаць на ўтрыманне курсаў[888]. 26 траўня 1933 г. Рада БША ўхваліла зварот да міністра з прапановай павялічыць бюджэт курсаў як надзвычай істотнай беларускай адукацыйнай установы ў Латвіі. У выпадку адмовы было вырашана скараціць заробкі кіраўніка (да 50 латаў) і лектараў (да 1,50 лата за гадзіну). На такі крок давялося пайсці, каб не спыняць набор новых курсантаў[889].

Захаваліся крыніцы, якія дазваляюць прасачыць дзейнасць курсаў у апошнія гады існавання. 5 ліпеня 1933 г. Рада БША пастанавіла, што навучанне на курсах мае цалкам адбывацца на беларускай мове[890]. На пасяджэнні органу 20 верасня К. Езавітаў прапанаваў увесці ў навучальную праграму лекцыі па школазнаўстве. Аднак супраць выступіў У. Пігулеўскі, і прапанова была адхілена. Кіраўнік Беларускага школьнага аддзела патлумачыў, што гэтае пытанне з'яўляецца ўнутранай справай педрады курсаў[891].

Падводзячы вынікі дзейнасці курсаў, належыць адзначыць, што ў перыяд, калі яны існавалі як 1-гадовыя (1921–1927 гг.) іх праслухала 68 настаўнікаў. Сярод іх былі такія вядомыя педагогі і грамадскія дзеячы, як: Віктар Вальтар, Алесь Махноўскі, Уладзімір Гусарэвіч, Мікола Талерка, Алесь Сальцэвіч, Галіна Нікіфароўская, Ніна Пінская[892]. Сярод тых, хто скончыў курсы ў пазнейшы перыяд, былі Пятро Масальскі, Эмілія Казакевіч, Ганна Кудраўцова, Мечыслаў Слосман, Павел Пырсікаў, Міхась Калінін, Дзмітрый Сахараў, Вікторыя Доўгая, Браніслаў Станкевіч і інш. Апошні выпуск курсаў адбыўся ўлетку 1934 г., калі іспыты здало шэсць асоб[893].

Нягледзячы на існаванне рыжскіх курсаў, беларускія школы па-ранейшаму адчувала нястачу кваліфікаваных кадраў. Дадатковыя цяжкасці стварала адлегласць, якая дзяліла латгальскую правінцыю і сталіцу. Напрыклад, 4 кастрычніка 1929 г. група выхаванцаў Даўгаўпілскай беларускай гімназіі

---

[886] LVVA, 2125 f., 5 ap., 13 l., 54 lp.

[887] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 84 lp.

[888] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 94 lp.

[889] *У Радзе Беларускага Аддзелу пры Міністэрстве Асьветы*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 5(22), с. 328–330.

[890] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 87 lp.

[891] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 94 lp.

[892] LVVA, 2125 f., 5 ap., 86 l., 58 lp.

[893] LVVA, 2125 f., 5 ap., 368 l., 33 lp.

звярнулася ў мясцовы аддзел ТБНЛ з просьбай зладзіць у горадзе кароткатэрміновыя летнія настаўніцкія курсы, бо не ўсе педагогі маюць грошы, каб ехаць у Рыгу на 2-гадовыя курсы[894].

Колькасць і агульная характарыстыка беларускіх школ

Судовы працэс 1925 г. нашкодзіў беларускай школьнай справе, але не знішчыў яе. На момант заканчэння працэсу ў краіне працавала адна сярэдняя і 35 пачатковых школ (у тым ліку 4 камплекты). Іх наведвалі 2 343 вучні, там працавалі 86 настаўнікаў. У гэты час колькасць беларускіх школ у суадносінах з лічбай беларускага насельніцтва Латвіі (паводле перапісу 1925 г.) апошні раз давала някепскі вынік. У 1925/26 гг. 88,2% вучняў-беларусаў наведвала школы з роднай мовай навучання. У наступныя гады гэта лічба зменшылася: у 1930/31 гг. яна складала 75,6%. Адбылося гэта пад уплывам змяншэння колькасці беларускіх школ. Частка беларусаў вучылася ў рускіх і латышскіх школах і гімназіях. Тым не менш, сітуацыя выглядала нядрэнна на фоне іншых нацменаў. У 1925/26 і 1930/31 гг. працэнт беларусаў, якія атрымлівалі асвету ў школах з роднай мовай навучання, быў вышэйшы, чым у палякаў (адпаведна 63,6% і 61,8%), габрэяў (64,4% і 67,9%) і літоўцаў (40% і 60%)[895]. У другой палове 1920-х гг. беларусы мелі адну пачатковую школу на 1 226 чал. Гэты паказнік быў горшы, чым у немцаў (780), рускіх (845), латышоў (960) і габрэяў (1190), але лепшы, чым у палякаў (1 504)[896]. Беручы пад увагу сказанае вышэй, належыць сцвердзіць, што права беларускай меншасці на школьную аўтаномію цалкам выконвалася.

Табліца 36. Пачатковыя школы нацыянальных меншасцей у Латвіі ў 1929/30 гг.

Нацыянальнасць	Колькасць	Лічба вучняў	Лічба настаўнікаў
Рускія	224	15 928	817
Беларусы	33	1 823	98
Немцы	89	8 773	544
Габрэі	78	9 957	609
Палякі	31	4 265	223
Літоўцы	7	738	47
Эстонцы	4	153	14
Мяшаныя школы	44	2 400	-

Крыніца: AAN, sygn.: MSZ, t. 5290, Raport pt. Mniejszości narodowe na Łotwie, 1 III 1929 r.

[894] LVVA, 2125 f., 5 ap., 80 l., 19 lp.

[895] J. Albin, *Polski ruch narodowy na Łotwie w latach 1919–1940*, Wrocław 1994, s. 125.

[896] J. Różycki, *Polacy na Łotwie*, Warszawa 1930, s. 18–19.

Аднак сетка беларускіх пачатковых школ развівалася нераўнамерна. Напрыклад, у 1925/26 гг. большасць іх знаходзілася ў наступных валасцях: Прыдруйскай (8), Істэрскай (7), Пасіенскай (4), Пустынскай (3), Ландскаронскай (2), Рунданскай (1), Граверскай (1) і ў Даўгаўпілсе (1)[897]. Прычым у некаторых з пералічаных валасцей беларускія школы дамінавалі. Напрыклад, у 1930/31 гг. у Пустынскай воласці агулам налічвалася 9 пачатковых школ, у тым ліку 2 былі латышскія, 4 – беларускія і 3 – польскія (у тым ліку 2 прыватныя)[898]. Разам з тым, у некаторых валасцях на Даўгаўпілшчыне з беларускім насельніцтвам беларускія школы адсутнічалі. Так было ў Краслаўскай, Скайсценскай, Капінскай, Малінаўскай і Вышкаўскай валасцях. На тэрыторыі трох першых жылі 5 862 беларусы, але дзейнічалі толькі тры беларускія камплекты ў мяшаных школах. Тым часам, у Малінаўскай і Вышкаўскай валасцях было 999 беларусаў, але ніводнай беларускай школы і камплекта. У найгоршым становішчы знаходзілася Ілукшчына, дзе, паводле перапісу насельніцтва 1925 г. беларусы складалі 11,69% жыхарства, але беларускіх школ не было. Тым часам, рускія (31,4%) мелі 5 школ, палякі (14,8%) – 2, латышы (17,2%) – 20. Не лепшым чынам сітуацыя выглядала на Рэжыччыне, дзе ў Вайводаўскай воласці ў 1925 г. пражывала 1 186 беларусаў, але не было ніводнай беларускай школы. Для параўнання, рускія, якіх было тут менш (999 чал.), мелі 2 школы[899].

Асноўную колькасць беларускіх школ па-ранейшаму складалі 4-годкі. Сярод 33 беларускіх школ у 1927 г. толькі пяць (2 – у Рызе, па адной – у Даўгаўпілсе, Лудзы і Ляўдарах) былі 6-класныміі[900]. Гэта становішча абмяжоўвала магчымасці паступлення ў беларускія гімназіі. З прычыны нязначнай колькасці 6-годак, бацькі, якія жадалі, каб іх дзеці працягвалі асвету, былі вымушаныя пасылаць іх у найбліжэйшыя школы, якія не з'яўляліся беларускімі. Асабліва на Даўгаўпілшчыне, дзе толькі адзіная на ўвесь павет 6-гадовая Даўгаўпілская школа давала магчымасць атрымаць поўную пачатковую асвету на роднай мове. Далёка не ўсе беларускія сяляне маглі пасылаць дзетак у гарадскую школу. Беднасць не дазваляла большасці вясковых вучняў здымаць кватэру ў Даўгаўпілсе. 15 кастрычніка 1929 г. на пасяджэнні школьнай рады С. Сахараў прапанаваў стварыць пры школе інтэрнат, каб даць магчымасць вучням, што скончыўлі 4-класныя школы, працягнуць асвету на роднай

---

[897] Э. Екабсонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [в:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 63–64.

[898] *Хроніка*, "Думка беларуса" 1931, № 1, с. 3.

[899] *Заданьні беларускае асьветы ў Латвіі (гутарка з кіраўніком Беларускага Аддзелу гр. В. Пігулеўскім)*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1927, № 6(4), с. 75.

[900] LVVA, 2125 f., 5 ap., 15 l., 15 lp.

мове. Ён лічыў, што праз адсутнасць у сваіх ваколіцах 6-гадовых беларускіх школ вучні-беларусы вымушаныя ісці ў чужыя школы[901]. У ліпені 1926 г. Беларускі школьны аддзел рабіў захады, каб адчыніць на Даўгаўпілшчыне яшчэ адну 6-гадовую беларускую школу. У тэорыі існавала магчымасць ператварэння 4-класнай школы ў 6-класую, але на практыцы гэта патрабавала дадатковых сродкаў ад мясцовага самакіравання, а яны былі сціплыя[902].

Адметнасцю беларускай школьнай справы ў гэты перыяд было з'яўленне прыватных школ. Яны адчыняліся там, дзе з нейкіх прычын не было "дзяржаўных" беларускіх школ, але асвета на роднай мове была запатрабаваная. Ініцыявалі адкрыццё прыватных школ у міжваеннай Латвіі два беларускія культура-асветныя таварыствы – "Беларуская хата" і Таварыства беларускіх настаўнікаў у Латвіі[903].

Да стварэння прыватных школ беларусаў падштурхнулі абставіны. У сярэдзіне і другой палове 1920-х гг. Беларускі школьны аддзел страціў шэраг школ. У сувязі з гэтым, ТБНЛ ініцыявала працэс адкрыцця прыватных школ. Іх утрымлівалі арганізацыі-стваральніцы, але дапускалася і атрыманне дзяржаўнай ці мясцовай дапамогі. Гаспадарскія выдаткі (апал, электрычнасць, прыбіранне) бралі на сябе бацькі вучняў[904].

У студзені 1927 г. у вёсцы Шылава (Пасіенская воласць Лудзенскі павет) намаганнямі ТБНЛ была адчыненая першая беларуская прыватная школа[905]. Згодна са статутам школы, настаўнікаў рэкамендавала ТБНЛ пасля ўзгаднення з БША. 10 студзеня 1927 г. настаўніцай была прызначана Кацярына Зэйгліш, выхаванка Даўгаўпілскай беларускай гімназіі і беларускіх настаўніцкіх курсаў. Бацькі забяспечылі школьнае памяшканне і ўзялі на сябе аплату паловы заробку настаўніцы, другую палову – ТБНЛ. З пачаткам 1927/28 гг. у Шылаўскай школе працавалі ўжо два настаўнікі Янка і Кацярына Зэйглішы, а наведвала яе 55 вучняў[906].

Архіўныя матэрыялы сведчаць, што ў 1929 г. беларускі актыў зрабіў няўдалую спробу адчыніць прыватную школу, у Аўлеўскай воласці[907]. Захады па стварэнні школы ў вёсцы Гаравыя (Скайсценская воласць) былі больш

---

[901] LVVA, 2125 f., 5 ap., 127 l., 40 lp.

[902] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 45 lp.

[903] *Справаздача Цэнтральнага Прауленьня*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1928, № 8(1), с. 110–111.

[904] *Статут Шылаускае Беларускае Прыватнае Пачатковае Школы Таварыства беларускіх вучыцялёў у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1927, № 5(3), с. 66; LVVA, 2125 f., 5 ap., 46 l., 5–6 lpp.

[905] *Прыватная беларуская школа ў Лудзенщчыне*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1927, № 3(1), с. 28.

[906] LVVA, 2125 f., 5 ap., 211 l., 113 lp.

[907] LVVA, 2125 f., 5 ap., 59 l., 13 lp.

удалыя. У 1929 г. ТБНЛ звярнулася ў Міністэрства асветы з просьбай дазволіць адчыніць у там прыватную беларускую школу. У звароце адзначалася, што "*дзе-хто неафіцыйна радзіць беларусам, каб яны дамагаліся беларускага камплекту пры польскай школе, што ў 2-х кіламетрах ад Гаравых*"[908]. Беларусы лічылі, што адкрыццё гэтага камплекту стане чарговай нагодай для польска-беларускага канфлікту, які скончыцца перадачай школы ў падпарадкаванне Агульнага школьнага дэпартамента. У студзені 1929 г. кіраўніцтва ТБНЛ паведаміла бацькам-беларусам з вёсак Гаравыя, Стальты, Дзірванішкі і Лайні пра намер адчыніць Гаравыя-Стальтаўскую прыватную 6-гадовую беларускую асноўную школу ТБНЛ. Таварыства брала на сябе абавязак утрымліваць школу, а бацькі павінны былі прадставіць памяшканне, паставіць у ім лаўкі і адшукаць настаўніка. У выніку ў 1929/30 гг. у вёсцы Гаравыя была адчынена 6-класная пачатковая школа ТБНЛ, якую наведвала 48 вучняў[909]. Настаўнікам быў прызначаны Данат Далецкі. У сувязі з матэрыяльнымі цяжкасцямі было вырашана перавесці школу на ўтрыманне Даўгаўпілскай павятовай школьнай управы. На пачатку 1930 г. інспектар беларускіх школ Я. Кастылюк заклікаў беларускія культура-асветныя таварыствы зрабіць адпаведныя захады[910]. 26 студзеня 1930 г. адбыўся з'езд сяброў ТБНЛ, які прыняў рэзалюцыю да інспектара беларускіх школ з наступнымі патрабаваннямі: "*Прыняць крокі, каб Дзвінская павятовая школьная ўправа прыняла бы на сваё ўтрыманне прыватную беларускую пачатковую школу ў вёсцы Гаравыя, Савейкаўскай воласці, й адчыніла бы беларускую школу ў Асунскай воласці*"[911]. На наступны дзень беларуская дэлегацыя (С. Сахараў, інспектар Я. Кастылюк, кіраўнік таварыства "Прасвета" П. Жэрдзі і 2 сябры школьнай рады) скіравалі адпаведны зварот у Даўгаўпілскую павятовую школьную ўправу[912]. Не захавалася дакладнейшых звестак наконт далейшага лёсу школы. Вядома, аднак, што 1 верасня 1933 г. на пасадзе кіраўніка школы БША зацвердзіў Мечыслава Юркевіча[913].

Улетку 1931 г. Даўгаўпілскі аддзел таварыства "Беларуская хата" звярнуўся ў Даўгаўпілскую школьную ўправу з просьбай даць дазвол на адкрыццё ў горадзе беларускай прыватнай школы для дарослых[914]. Кіраўніцтва таварыства лічыла, што "грунт і вучні дзеля стварэння школы ёсць, толькі патрэбна

---

[908] *А Беларускае школы ў Гаравых усё яшчэ німа!*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1929, № 9(1), с. 5.

[909] LVVA, 2125 f., 1 ap., 83 l., 6 lp.

[910] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1004 l., 68 lp.

[911] LVVA, 2924 f., 1 ap., 83 l., 24 lp.

[912] Бацька, *В. Гаравая, Скайсьценскай воласьці*, "Наша доля" 1930, № 2 ад 7 лютага, с. 4.

[913] *З жыцьця Т-ва Беларускіх вучыцялёў у Латвіи*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 6(23), с. 343.

[914] LVVA, 2125 f., 5 ap., 258 l., 44 lp.

праца і грошы”[915]. Аднак гарадскія школьныя ўлады не спяшаліся разглядаць гэта пытанне. Кіраўніцтва таварыства лічыла, што школьная ўправа свядома марудзіць, што беларускі бок разглядаў як доказ існавання ў гэтым органе “руска-польскіх уплываў”. 31 ліпеня 1931 г. управа Даўгаўпілскага аддзела таварыства “Беларуская хата” папрасіла Беларускі школьны аддзел звярнуцца непасрэдна да міністра асветы[916]. Даўгаўпілскі аддзел таварыства таксама прасіў БША прызначыць 240 латаў на аплату будынка, у якім мелася размясціцца будучая школа. У лісце чытаем: “*У іншым выпадку наша памяшканне, у якім таварыства думае размясціць праектаваную школу, пяройдзе ў рукі 5 расейскай школы як адзін з лепшых будынкаў на старым Фарштаце м. Дзвінска, і мы, беларусы, многа страцім*”[917]. У выніку гарадскія ўлады пагадзіліся на адкрыццё школы, але ў перашкодзе сталі матэрыяльныя цяжкасці. 11 верасня 1931 г. кіраўніцтва Даўгаўпілскага аддзела таварыства “Беларуская хата” паведамляла, што “*ў арганізаванай т-вам школе праца ідзе добра, але німа ніякіх сродкаў на ўтрыманне школы, зараз неабходна закупіць вучэбныя дапамогі, аплаціць памяшканне, закупіць дровы, бо ўжо робіцца зімна, і таму звяртаюся з просьбай выпісаць на імя т-ва на дапамогу хаця б дзіцячага саду, які ўжо афіцыйна існуе, латаў 300, гэтыя грошы вельмі і вельмі неабходны. Па-другое, вельмі прашу як мага хутчэй высветліць справу з зацверджаннем статута школы, бо расейцы і палякі сярод бацькоў распаўсюджваюць чуткі, што іх абманываем, што ніякай школы няма і не будзе, што гэта дзіцячы сад, які не мае ніякіх правоў*”[918]. У рэшце рэшт у кастрычніку 1931 г. Міністэрства асветы адмовілася адчыніць беларускую школу[919].

Кволым месцам беларускай пачатковай асветы было тое, што яна не давала прафесійных ведаў, а толькі агульнаадукацыйныя. У выніку большасць дзетак пасля школы вярталася да працы на зямлі. Беларускі актыў усведамляў патрэбу стварэння прафесійных школ. У студзені 1927 г. кіраўніцтва Лудзенскага аддзела ТБНЛ (С. Казека) звярнулася ў БША з прапановай адчыніць у 1929/30 гг. у беларускіх школах на Лудзеншчыне рамесніцкія класы. У звароце адзначалася, што ўсе прафесійныя школы, якія існуюць у павеце, з’яўляццца латышскімі, а тым часам, запатрабаванне на рамесніцкія спецыяльнасці (асабліва будаўніцтва) сярод беларускага насельніцтва значнае[920]. 16 ліпеня 1927 г. Рада Беларускага школьнага аддзела абмеркавала справу стварэння сельскагаспадарчай школы або адкрыцця летніх

[915] LVVA, 2125 f., 5 ap., 88 l., 46 lp.
[916] LVVA, 2125 f., 5 ap., 258 l., 45 lp.
[917] LVVA, 2125 f., 5 ap., 258 l., 46 lp.
[918] LVVA, 2125 f., 5 ap., 258 l., 51 lp.
[919] LVVA, 2125 f., 5 ap., 258 l., 58 lp.
[920] LVVA, 2125 f., 5 ap., 85 l., 5 lp.

сельскагаспадарчых курсаў. Аднак было вырашана адмовіцца ад гэтай задумы, а замест гэтага арганізаваць сельскагаспадарчыя лекцыі з мэтай стварэння класаў з сельскагаспадарчым ухілам[921].

Тым часам кіраўнік БША бачыў патрэбу таго, каб у пачатковых школах вучылі не толькі чытаць і пісаць, але і давалі веды, якія павышаюць сельскагаспадарчую культуру. Перашкаджала, аднак, адсутнасць школьных зямельных надзелаў, кансерватызм вёскі, нястача гаспадарчага і працоўнага інвентару ў школах, позні пачатак заняткаў. Вырашэнне гэтых праблем кіраўнік БША бачыў у тым, каб сетка беларускіх школ стваралася прапарцыйна да нацыянальнага складу насельніцтва і адкрыцця новых беларускіх камплектаў. Ён лічыў прыярытэтам на наступныя гады: 1) павелічэнне сеткі пачатковых школ; 2) паступовае ператварэнне 4-класных школ у 6-класныя (на пачатку 1 – у Лудзенскім павеце і 2 – у Даўгаўпілскім); 3) наданне школьнаму навучанню больш жыццёвага характару; 4) паляпшэнне ўмоў працы настаўнікаў; 5) развіццё пазашкольнае адукацыі[922].

Жыццё паказала, што большасць гэтых пастулатаў не ўдалося выканаць. Больш за тое, у разгляданы час назіралася іншая тэндэнцыя: сістэматычнае змяншэнне колькасці беларускіх пачатковых школ. Дынаміку змен адлюстроўвае дадзеная табліца.

Табліца 37. Колькасць беларускіх школ у 1925–1934 гг.

	1925/26	**1926/27**	**1927/28**	**1928/29**	**1929/30**	**1930/31**	**1931/32**	**1932/33**	**1933/34**
Сярэднія школы									
Даўгаўпілскі павет	1	1	1	1	1	1	1	1	1
Лудзенскі павет	0	0	0	0	0	0	0	0	0
Рыга	0	0	0	0	1	1	1	1	1
Разам	1	1	1	1	2	2	2	2	2
Пачатковыя школы і камплекты									
Даўгаўпілскі павет	18	18	19	21	21	22	19	19	17
Лудзенскі павет	16	15	15	12	4	3	2	1	1
Рыга	1	2	3	3	3	4	4	4	4
Разам	35	35	37	36	28	29	25	24	22
Сума	36	36	38	37	30	31	27	26	24

Крыніца: Уласнае апрацаванне на падставе: LVVA, 2125 f., 5 ap., 259 l., 54–55, 63, 67, 71 lpp.; LVVA, 2125 f., 5 ap., 333 l., 60–64 lpp.; *Сьпіс беларускіх школ і настаўніцтва ў Латвіі ў бягучым 1928–29 навучальным годзе,* "Беларуская школа ў Латвіі" 1929, № 9(1), с. 12–14; К. Езавітаў, *Беларускія школы ў Латвіі ў 1933–34 навуч. годзе,* "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 7(24), с. 362–366.

[921] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 42, 44 lpp.

[922] *Заданьні беларускае асьветы ў Латвіі (гутарка з кіраўніком Беларускага Аддзелу гр. В. Пігулеўскім),* "Беларуская школа ў Латвіі" 1927, № 6(4), с. 74–78.

Большасць школ, якія страцілі беларусы, пераходзіла ў юрысдыкцыю Агульнага школьнага дэпартамента. Паводле закону, у падпарадкаванне апошняму перадаваліся школьныя ўстановы, дзе вучні-нелатышы складалі менш за 60%. Змена нацыянальнай юрысдыкцыі школ адбывалася на патрабаванне бацькоў, якія складалі пісьмовыя заявы ў павятовыя школьныя рады. Варта падрабязней разгледзець дадзены працэс.

У 1925/26 гг. БША страціў шэраг школ на Лудзеншчыне (Рунданскую, Брыгаўскую, Пудынаўскую) і Даўгаўпілшчыне (камплект у Крэйпанаўскай школе). Страту часткова кампенсавала адкрыццё двух школ у Даўгаўпілскім павеце – Майшэльскай і Келаўскай, а таксама 2-й Рыжскай[923]. Існавала пагроза, што беларусы страцяць Кокінскую школу, паколькі Даўгаўпілская павятовая школьная ўправа рабіла захады, каб яна таксама апынулася ў падпарадкаванні Агульнага школьнага дэпартамента з захаваннем у ёй беларускай мовы як дадатковай. Захады павятовай адміністрацыі выклікалі незадаволенасць бацькоў, якія сабралі 51 подпіс пад петыцыяй і дэлегавалі ў Даўгаўпілс свайго прадстаўніка Сітніка. У выніку школа засталася ў юрысдыкцыі БША[924].

Наступныя два навучальныя гады (1926/27 і 1927/28 гг.) былі больш удалымі: адчынілася дадатковая беларуская школа ў Рызе. З аналізу справаздачы дзейнасці інспектара беларускіх школ за 1928/29 гг. вынікае, што яму частка даводзілася выязджаць на інспекцыі і ўдзельнічаць у пасяджэннях школьных рад або павятовых школьных управаў, на якіх разглядаліся справы пераходу беларускіх школ у іншыя юрысдыкцыі. У адной са справаздач ён пісаў, што, нягледзячы на антыбеларускія захады з боку нядобразычліўцаў, Беларускі школьны аддзел не страціў ніводнай школы і ніводзін беларускі настаўнік не быў звольнены. Больш за тое, інспектар спрабаваў адчыніць новыя школы і камплекты на Даўгаўпілшчыне (у вёсках Савейкі, Ляльнікі, Дзірванішкі, Гарбачова і Гаравая)[925]. Аднак гэта не затрымала працэс пераходу школ у іншыя юрысдыкцыі. У гэты час БША страціў шэраг школ на карысць Рускага школьнага аддзела (гл. раздзел IV). У той самы час была зробленая спроба вярнуць у падпарадкаванне Беларускага школьнага аддзела Станкевічаўскую школу, страчаную беларусамі яшчэ ў 1924/25 гг. Улетку 1928 г. бацькі яе вучняў (43 чал.) звярнуліся ў БША з адпаведным патрабаваннем. Справа, аднак, не ўдалася[926].

Чарговая хваля страт прайшла на пачатку 1930-х гг. У 1929/30 гг. беларусы страцілі аж восем школ у Лудзенскім павеце: Канецпольскую, Ляўдарскую, Лунеўскую, Цуцуркаўскую, Цуцурскую, Чыўчынскую,

---

[923] LVVA, 2125 f., 5 ap., 333 l., 62–63 lpp.

[924] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 134, л. 77.

[925] LVVA, f. 2125, ap. 5, 84 l., 36 lp.; LVVA, 2125 f., 5 ap., 387 l., 10–12 lpp.

[926] LVVA, 2125 f., 5 ap., 387 l., 17 lp.; LVVA, 2125 f., 5 ap., 84 l., 25 lp.

Шушкоўскую і Шылаўскую[927]. У 1930/31 гг. іх лёс падзяліла Залеская школа на Лудзеншчыне. Такім чынам, у тым навучальным годзе ў падпарадкаванні Беларускага школьнага аддзела былі толькі тры школы ў павеце: Лудзенская, Борхаўская і Рулеўская[928].

Захаваліся архіўныя крыніцы, якія дазваляюць прасачыць за баталіяй вакол юрысдыкцыі некаторых з гэтых школ. Беларускі бок намагаўся прадухіліць іх перавод з падпарадкавання БША. Школьная рада Цуцуркаўскай школы 29 траўня 1930 г. пратэставала супраць перадачы школы ў Агульны школьны дэпартамент даводзячы, што супраць змены юрысдыкцыі выступалі многія бацькі. Рада лічыла, што камісія, якая разглядала справу юрысдыкцыі школы, не была аб'ектыўная падчас апытання бацькоў[929]. У сваю чаргу Рада Беларускага школьнага аддзела 5 чэрвеня 1930 г. звярнулася ў Міністэрства асветы з просьбай вярнуць Шылаўскую школу. У дакуменце адзначалася, што звесткі Лудзенскай павятовай школьнай управы наконт адсутнасці беларусаў у навакольных вёсках не адпавядаюць рэчаіснасці, а перадача школы іншым аддзелам выклікала абурэнне большасці бацькоў[930]. На пасяджэнні ўправы таварыства "Беларуская хата" 30 жніўня 1931 г. была абмеркаваная сітуацыя Залескай школы. У страце школы прысутныя вінавацілі кіраўніка Беларускага школьнага аддзела У. Пігулеўскага і інспектара П. Журкоўскага, якія не надалі справе належнай увагі[931].

Пратэсты беларускага боку не далі плёну і не затрымалі страты чарговых школ. У 1931/32 гг. з падпарадкавання БША былі выведзеныя на Лудзеншчыне: Рулеўская; на Даўгаўпілшчыне – Вайцюлеўская і Карклінская. Беларусы таксама страцілі камплект у Ліўчынскай школе (Даўгаўпілскі павет). Рашэнне ў дачыненні да Карклінкай школы ўлады абгрунтавалі адсутнасцю патрэбнай колькасці вучняў-беларусаў, а ў выпадку Вайцюлеўскай – нешматлікасцю вучняў і незадаволенасцю бацькоў настаўнікам М. Талеркам[932]. Апошняя справа была прадметам увагі ўдзельнікаў настаўніцкай канферэнцыі, якая адбылася 15 чэрвеня 1932 г. у Даўгаўпілсе. М. Талерка сцвярджаў, што нешматлікасць вучняў у школе тлумачыцца тым, што ў Індры працуе латышская школа, вучні якой атрымлівалі абеды, вопратку і абутак. Кіраўнік беларускай школы лічыў, што трэба патрабаваць, каб у Індраўскай школе ўвялі заняткі па беларускай мове, накіраваўшы туды настаўніка-беларуса, бо ў гэтай школе вучыцца значны адсотак беларусаў. Удзельнікі канферэнцыі пастанавілі ўсімі

[927] LVVA, 2125 f., 5 ap., 333 l., 63 lp.
[928] LVVA, 2125 f., 5 ap., 259 l., 66 lp.
[929] LVVA2125, f., ap. 5, l. 47, 27–28 lpp.
[930] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 16 lp.
[931] LVVA, 3235 f., 6 ap., 196 l., 24 lp.
[932] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 71 lp.

сродкамі ратаваць Вайцюлеўскую школу і стварыць стыпендыйны фонд для дапамогі незаможным вучням, у які меліся адлічваць з заробку кіраўніка па 15 латаў, а настаўнікаў – па 4 латы ў год[933]. Тым не менш, у 1932 г. Ваўцюлеўская школа была зачынена, а вучні перайшлі ў мясцовую латышскую школу. Беларускі актыў разглядаў закрыццё як мэтаскіраваны наступ нядобразычліўцаў на правы беларускай меншасці[934].

Чорныя хмары збіраліся над школай у Лудзы. Варта падкрэсліць, што яна з'яўлялася галоўным беларускім культурна-асветным асяродкам у горадзе. У 1926/27 гг. у ёй працавалі шэсць настаўнікаў: Раіса Жданко (кіраўнік), С. Казека, Стэфанія Казека, М. Іваноў, Лідзія Чыган і Аляксей Гадлеўскі. Вучняў было каля 120, значна менш, чым у папярэднія гады (у 1922/23 гг. – 170)[935]. Яшчэ ў 1930 г. прадстаўнікі мясцовага самакіравання патрабавала ліквідаваць школу. Настаўнік С. Казека адзначаў, што рускія і польскія актывісты праз сваіх дэпутатаў у Лудзенскай гарадской думе рабіла захады, каб гарадскія ўлады скасавалі школьны бюджэт. 5 траўня 1930 г. школьная рада падрыхтавала пратэст супраць закрыцця школы, які быў перададзены ў БША. Кіраўнік аддзела прапанаваў падаць пратэст міністру асветы ад імя ўсёй школьнай супольнасці. Незалежна ад гэтага кіраўнік Беларускага школьнага аддзела 13 траўня перадаў міністру асветы ўласны пратэст супраць закрыцця школы. Але сябра Рады БША К. Езавітаў лічыў, што кіраўнік аддзела прыклаў недастаткова намаганняў, каб уратаваць школу ад закрыцця. Падчас пасяджэння Рады БША ён запатрабаваў, каб апошні патлумачыў, што ён зрабіў, каб перадухіліць ліквідацыю Лудзенскай школы[936].

Напады на школу спыніліся ў 1931 г., калі беларусы правялі ў гарадскую думу свайго прадстаўніка А. Вярыгу[937]. Тым не менш, у 1932 г. Лудзенская школьная павятовая ўправа пастанавіла аб'яднаць беларускую і польскую школы ў адну з захаваннем у ёй толькі аднаго настаўніка-беларуса С. Казекі[938]. Рашэнне выклікала хвалю абурэння сярод беларусаў. 6 траўня 1932 г. Педрада звярнулася да міністра асветы, сенацкай камісіі і Беларускага школьнага аддзела з патрабаваннем не ліквідаваць беларускую школу, бо ў ёй навучалася 89 вучняў (з якіх 68% беларусаў). Адначасова прайшлі бацькоўскі сходы,

---

933 *Конфэрэнцыя беларускіх вучыцялёў у Дзьвінску*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 2(12), с. 169.

934 *Хроніка беларускага жыцьця ў Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 4(14), с. 224.

935 С. Казека, *Гістарычная спраўка аб Лудзенскай беларускай 6-ціклясовай пачтковай школе*, "Голас беларуса" 1926, № 19 ад 1 верасня, с. 5.

936 LVVA, 2125 f., 5 ap., 155 l., 283 lp.

937 С. Казэка, *Лудзенская беларуская асноўная 6-ціклясовая школа за 10 год працы – з 1922 па 1932 год*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 2(12), с. 163–164.

938 *Конфэрэнцыя беларускіх вучыцялёў у Дзьвінску*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 2(12), с. 169.

удзельнікі якіх таксама пратэставалі[939]. 10 ліпеня 1932 г., калі міністр асветы наведваў Лудзу, прадстаўнікі мясцовых беларускіх арганізацый (Лудзенскага аддзела таварыства "Беларуская хата" і ТБМЛ) перадалі яму петыцыю з заклікам захаваць у Лудзы самастойную беларускую школу[940]. У дакуменце адзначалася, што за спробай ліквідаваць школу стаяць непрыхільныя да беларусаў "русіфікатары і паланафілы", якія маюць уплыў у гарадскім самакіраванні і з самага пачатку паставілі за мэту знішчэнне беларускай школы ў Лудзы[941].

---

[939] С. Казека, *Лудзенская беларуская асноўная 6-ціклясовая школа за 10 год працы – з 1922 па 1932 год*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 3(13), с. 185.

[940] *Хроніка беларускага жыцьця у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 2(12), с. 175.

[941] У дакуменце чытаем: "*У звязку з пастановай Лудзенскай гарадзкой школьнай управы ад 3 траўня с.г. аб зачыненні з 1-га жніўня с.г. у Люцыне беларускай асноўнай школы, Люцынскі аддзел культ.-прасв. Т-ва 'Беларуская хата' зварочвае Вашу ўвагу, гр. Міністр, на наступнае: Пасьля перапісу 1920 г. у гор. Люцын значылася 1555 беларусаў і толькі 479 велікарусаў і 290 палякаў. Такая лічба беларусаў была болей чым задавальняючай для таго, каб адчыніць у Люцыне ў 1922 г. беларускую асно. школу. У новаадчыненую беларускую школу паступіла шмат вучняў, частка якіх перайшла з расейскай і польскай школы і ў 1922/23 вуч. годзе школа мела 180 вуч. у 4-х клясах. Такое ўмацаваньне беларускае школы ў Люцыне занепакоіла заўсёды варожых да беларусаў вялікадзяржаўных русіфікатараў і паланізатараў і прадстаўнікі іх у мясцовым самаўрадзе пачалі проці школы ўпартую барацьбу, каб за ўсялякую цану зліквідаваць у Люцыне беларускую школу і такім чынам мець поўную магчымасць дэнацыяналізаваць беларусаў, перарабляючы праваслаўных беларусаў на велікарусаў, беларусаў каталікоў – на палякаў. У першую чаргу яны пастараліся выкарыстаць у сваіх мэтах народны перапіс 1925 года і тую вельмі нявыгадную сітуацыю, якая злажылася для беларусаў падчас следства і беларускага працэсу ў пачатку 1925 года. Па перапісе 1925 г. лік велікарусаў у Люцыне павялічыўся за кошт беларусаў з 479 да 1256 і лік палякаў з 290 да 445, а лічба беларусаў, напалоханых працэсам, зменшылася да 64. Такое катастрафічнае палажэнне ліку беларусаў у Люцыне адбылося дзякуючы таму, што беларускія русіфікатары і паланізатары прынялі ў перапісе самы актыўны ўдзел і пастараліся ўсюды, дзе толькі было магчыма, падмяніць нацыянальны прынцып – рэлігійным, запісваючы праваслаўных – рускімі, а каталікоў палякамі. Нягледзячы на такія вынікі перапісу, лік вучняў-беларусаў у школе прадаўжаў быць дастатачным і школа прадаўжала існаваць, што ў свой чарод не давала спакою тым, хто ўвесь час думаў аб зачыненні беларускай школы. Яны, маючы вялікі ўплыў у справах мясцовага самаўраду, рабілі ўсялякія перашкоды школе ў такім будынку, у якім немагчыма было працаваць, бо яно было і сырое, і халоднае, і цёмнае: некаторыя класныя пакоі не мелі зусім вакон. Адносіны да школы ад гарадскога самаўраду пад уплывам вышэйпамянутых варожых школе элементаў увесь паступовы час псаваліся і ў 1930 годзе гарадская дума нават прыняла бюджэт па школе толькі на 7 месяцаў у надзеі на тое, што за летнія канікулы магчыма будзе пераканаць усіх бацькоў нашай школы, што школа зачынена і няхай яны аддадуць сваіх дзяцей у іншыя школы. Ніякіх угавораў бацькі не паслухалі і моцна пратэставалі проці такога адношання самаўраду да школы, але толькі праз пяць месяцаў пасля пачатку вуч. году дума павінна была ўступіцца дамаганням бацькоў і адпусціла неабходныя на ўтрыманне школы грошы ў дадатковым бюджэце. Гэтая гісторыя нашай школы за 10 год служыць прыкладам таго, што вялікадзяржаўныя русіфікатары і паланізатары ўвесь час змагаліся з нашай школай і стараліся яе зліквідаваць, а таму пастанова Люцынскай гарадз. управы ад 3 траўня с.г. аб зачыненні нашай школы будзе спаўненьнем дамаганняў тых,*

22 верасня 1932 г. Рада БША абмеркавала сітуацыю вакол Лудзенскай школы. Кастусь Езавітаў лічыў, што рашэнне гарадскога самакіравання незаконнае, і ў выніку рада яго апратэставала[942]. Была разгледжаная і справа вяртання ў падпарадкаванне БША іншых школ у Латгаліі. Настаўнік У. Раткін лічыў, што беларускае насельніцтва ў наваколлі Дудэльскай і Вайцюлеўскай школ вызначаецца высокай нацыянальнай свядомасцю, таму бацькі ніколі б не пажадалі там замены беларускіх школ на латышскія. Ён выказаў сумнеў у праўдзівасці сцвярджэння павятовай школьнай рады, што бацькі жадалі закрыцця беларускіх школ. Рада БША падтрымала яго прапанову аднавіць Вайцюлеўскую школу ў выглядзе беларускага камплекту ў Індраўскай школе. Выкананне гэтага задання ўсклалі на таварыства "Прасвета". Апрача таго, рада ўхваліла прапанову К. Езавітава стварыць беларускі камплект у Рулеўскай школе. Гэтай справай павінна было заняцца таварыства "Беларуская хата"[943]. У працяг рэалізацыі тых пастаноў 7 ліпеня 1933 г. Рада БША накіравала міністру асветы заяву бацькоў-беларусаў з індраўскага школьнага раёна з патрабаваннем адчыніць беларускі камплект у Індраўскай школе[944].

Пратэсты не здолелі спыніць ліквідацыі Лудзенскай школы. У 1932 г., пасля дзесяці гадоў існавання, Лудзенская беларуская 6-гадовая пачатковая школа спыніла дзейнасць. Пасля яе страты ў Лудзенскім павеце засталася толькі адна школа (Борхаўская), падпарадкаваная Беларускаму школьнаму аддзелу.

Крыху лепш сітуацыя выглядала на Даўгаўпілшчыне. Аднак тут таксама шэраг школ знаходзіўся пад пагрозай закрыцця або перадачы ў іншыя аддзелы. Існавала пагроза страты Круманаўскай школы, якую бацькі вучняў патрабавалі перавесці ў іншы школьны аддзел. У адказ інспектар беларускіх школ запатрабаваў ад кіраўніка школы перапісаць усіх дзяцей беларускай нацыянальнасці і давесці іх лік да 60. У адваротным выпадку школе пагражала перадача ў Агульны школьны дэпартамент. Аднак у выніку ўстанова засталася ў складзе БША[945]. У 1931/32 гг. пагроза перадачы ў Агульны школьны дэпартамент навісла над Дудэльскай школай. Мясцовы настаўнік Ян Рэчыс-Кальніньш пачаў збіраць подпісы бацькоў за ператварэнне школы з беларускай у латышска-рускую. Супраць выступіў кіраўнік школы Д. Казлоўскі, які тлумачыў, што бацькі вучняў былі ўведзеныя ў зман: Я. Рэчыс-Кальніньш казаў ім, што збірае подпісы за ўтрыманне яго ў школе. Кіраўнік нават пагражаў

хто 10 год дамагаўся гэтай ліквідацыі, каб прадаўжаць русіфікацыю і паланізацыю беларусаў. А таму мы просім Вас, гр. Міністр, адмяніць памянёную пастанову школьнай управы і даць магчымасць беларускаму жыхарству гор. Люцына і яго ваколіц – вучыць сваіх дзетак у роднай школе і на роднай мове". LVVA, 2125 f., 5 ap., 155 l., 184–185 lpp.

942 LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 73 lp.

943 LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 71 lp.

944 LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 89 lp.

945 LVVA, 2125 f., 5 ap., 149 l., 4 lp.

настаўніку-латышу судом[946]. 24 чэрвеня 1932 г. адбыўся сход настаўнікаў і бацькоў, на якім прысутнічалі прадстаўнік Рады БША А. Раткін і старшыня Даўгаўпілскага аддзела ТБНЛ А. Барткевіч. Падчас сходу высветлілася, што бацькі не жадаюць перадачы школы ў Агульны школьны дэпартамент. Яны патлумачылі, што іх подпісы пад заявай у павятовую школьную ўправу збіралі невядомыя людзі, якія абяцалі, што ў школе з'явяцца новыя настаўнікі. Бацькі падтрымалі Д. Казлоўскага, які за год працы зладзіў два беларускія спектаклі і вечарыны, а ажно 6 вучняў школы паступіла ў Даўгаўпілскую гімназію. Да гэтага ніводнаму вучню школы за 9 гадоў яе існавання не ўдалося трапіць у сярэднюю школу[947].

Паводле ўскосных крыніц, рабіліся спробы вываду з падпарадкавання Беларускага школьнага аддзела Лупандаўскай школы. Настаўніца Л. Александровіч паведамляла, што яе наведаў школьны інспектар Кунцан, які склікаў сход бацькоў і заахвочваў іх ператварыць школу ў латышскую. Аднак, паводле слоў настаўніцы, мясцовыя сяляне паставіліся катэгарычна адмоўна да яго прапановы. Карэспандэнт часопіса "Беларуская школа ў Латвіі" з гонарам адзначаў: "*Трэба цешыцца стойкасці сялян і адзначыць, што так усе беларусы павінны трымацца свае роднае школы, як лупандаўцы, каб ніхто не мог над намі і нашай школай падсміхацца*"[948].

Ліквідацыя пагражала Талаеўскай школе, бо частка бацькоў патрабавала перадаць яе ў Агульны школьны дэпартамент. Справай займаўся Даўгаўпілскі павятовы школьны інспектар. Беларускі актыў вінаваціў яго ў спробе схіліць бацькоў на бок Агульнага школьнага дэпартамента, заахвочваючы матэрыяльнымі выгодамі. 16 лютага 1933 г. школу наведала камісія, якая высвятляла настроі бацькоў. У яе склад уваходзілі павятовы школьны інспектар, прадстаўнікі латышскага і беларускага настаўніцтва. У выніку большасць бацькоў выказалася за тое, каб пакінуць школу ў падпарадкаванні БША. Камісія высветліла, што некаторыя бацькі, якія раней падпісалі зварот з патрабаваннем перадаць школу ў Агульны школьны дэпартамент, зрабілі гэта памылкова. Падпісанты тлумачылі свой учынак страхам, што беларускую школу зачыняць і надзеяй на тое, што школа, стаўшы латышскай, будзе мець лепшую матэрыяльную дапамогу. Даўгаўпілская павятовая школьная ўправа не спыніла пасля таго спробы перавесці школу ў Агульны школьны дэпартамент. Аднак школа засталася ў падпарадкаванні Беларускага школьнага аддзела[949].

---

[946] LVVA, f. 2125, apr. 5, 130 l., 33 lp.

[947] А. Барткевіч, *На сходзе бацькоў Дудэльскае беларускае пачатковае школы*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 3(13), с. 181.

[948] Дзьвінчук, 1933, *Канфэрэнція беларускіх вучыцялёў Дзьвіншчыны*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 3(20), с. 292.

[949] LVVA, 2125 f., 5 ap., 48 l., 12, 14 lpp.; Дземенскі, *Бацькі Толаеўскае школы бароняць сваю школу*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 5(22), с. 338.

Беларускі актыў шукаў магчымасці спыніць закрыццё беларускіх школ. На старонках прэсы К. Езавітаў дзяліўся меркаваннямі пра тое, што павінен зрабіць беларускі бок, каб палепшыць сітуацыю. Выратаванне ён бачыў у стварэнні з ініцыятывы бацькоў і настаўнікаў пры кожнай школе таварыства самадапамогі бяднейшым вучням. Дзеяч звяртаў увагу, што на належным узроўні функцыянуюць тыя школы, дзе добра наладжанае супрацоўніцтва паміж школьнай і педагагічнай радамі[950]. 31 жніўня 1931 г. кіраўніцтва таварыства "Беларуская хата" падчас пасяджэння звярнула ўвагу на патрэбу спыніць працэс ператварэння беларускіх школ у латышскія. Стратэгію супрацьдзеяння гэтай з'яве абмяркоўвалі на беларускай настаўніцкай канферэнцыі Даўгаўпілскага павета 26 лютага 1933 г. Яе ўдзельнікі А. Раткін і А. Барткевіч прапанавалі накіраваць у школы групы асоб, каб яны ладзілі музычныя выступы і ўзнялі беларускі настрой. Тым часам Э. Вайводзіш і А. Махноўскі звярталі ўвагу на небяспеку ператварэння беларускіх школ у памежнай паласе ў агульныя. Кіраўнік Беларускага школьнага аддзела У. Пігулеўскі прапанаваў настаўнікам пісьмова інфармаваць яго пра спробы пераводзіць беларускія школы ў Агульны школьны дэпартамент, каб БША змог падрыхтавацца да абароны. Ён падкрэсліваў, што змагацца за школы трэба зараз, бо набліжаўся чарговы перапіс насельніцтва, вынік якога ў выпадку адсутнасці беларускіх школ будзе нядобрым для беларусаў[951].

Беларускі бок шукаў прычыны крызісу, які выяўляўся ў змяншэнні колькасці школ. Мясцовыя дзеячы лічылі, што галоўнай прычынай заняпаду з'яўляецца кепскае матэрыяльнае становішча праз адсутнасць належнай падтрымкі з боку ўлад. Іншым чыннікам, які, на думку беларускіх дзеячаў, спрыяў змяншэнню колькасці беларускіх школ, была актыўнасць "чужынцаў" – рускіх і палякаў (гл. радзел IV). На думку У. Пігулеўскага, нежаданне часткі беларускага сялянства аддаваць дзяцей у беларускія школы, было наступствам беларускага працэсу і пагаршэння дзяржаўнай палітыкі ў дачыненні да беларускай меншасці: "*Шырокі ахват гэтым працэсам цёмнае латгальскае вёскі ўнёс у псіхіку беларускага сялянства падазронасць, а ўрэшце і перакананасць, што, быццам, вядзецца прынцыповае праследаванне беларускае школы, а таму пасылаць у беларускую школу – рэч не толькі неспакойная, але і небяспечная. Зразумела, што ворагі беларускага нацыянальнага адраджэння, галоўным чынам прадстаўнікі расейскіх і польскіх вялікадзяржаўных ідэалогій, шырока выкарысталі гэты псіхалагічны надлом у беларускім сялянстве і пры дапамозе самых несумленнных сродкаў павялі агітацыю, варожую беларускай школе. Беларускае вучыцельства не магло процівапаўс-*

[950] К. Езавітаў, *Беларускія школы ў Латвіі ў 1933–34 навуч. годзе*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 7(24), с. 362.

[951] LVVA, 2125 f., 5 ap., 14 l., 1 lp.

таць энергійна гэтаму дэнацыяналізуючаму працэсу, бо, знаходзячыся ўвесь час пад пагрозаю адміністрацыйных рэпрэсіяў, яно павінна было сцісла замкнуцца ў педагагічнай працы і зусім адысці ад культурна-грамадскае працы сярод шырокіх беларускіх сялянскіх масаў"[952]. Беларускі дзеяч дадаваў, што нярэдка бацькі кіраваліся матэрыяльнымі выгодамі, бо ў латышскіх школах вучняў забяспечвалі абуткам і вопраткай, бясплатнымі сняданкамі і абедамі, падручнікамі і школьнымі прыладамі[953]. Гэтую думку падзялялі некаторыя сябры Рады БША, якія сцвярджалі, што перашкодай у працы з'яўляюцца латышскія школы, якія звабліваюць да сябе вучняў дармавой вопраткай ці гарачай ежай[954].

Аднак такое меркаванне толькі часткова адпавядала рэчаіснасці. Прычыны былі глыбейшыя. Варта прывесці меркаванне Р. Плыгаўкі, які лічыў, што з боку дзяржавы няма перашкод да адкрыцця новых беларускіх школ, а змяншэнне іх колькасці звязана са слабым узроўнем нацыянальнай свядомасці беларусаў, якія не карыстаюцца ў поўнай меры грамадзянскім правам на нацыянальную школу. Паводле закона, адкрыццё школы або камплекта патрабавала толькі 30–40 бацькоўскіх заяў у мясцовую школьную ўправу і БША. Ён падкрэсліваў, што "*трэба памятаць, што ніхто ім школы не дасць, калі яны самі не будуць прасіць і дамагацца, бо 'пад ляжачы камень і вада не цячэ'*"[955]. Развіваючы думку, інспектар беларускіх школ адзначаў, што ў большасці выпадкаў страта школ вынікала з слабой сувязі паміж школай і бацькамі[956]. Пацвярджае гэта факт, што змяншэнне колькасці беларускіх школ адбылося напярэдадні і пасля перапісу насельніцтва 1930 г., які зафіксаваў чарговае зніжэнне лічбы тых, хто запісаўся беларусам.

Школы, перададзеныя ў Агульны школьны дэпартамент, не былі цалкам страчаныя для беларускай меншасці. У іх па-ранейшаму працавалі настаўнікі-беларусы. Так было ў Цуцуркаўскай (настаўнік Яўстах Хруцкі), Канецпольскай (Васіль Нікіфароўскі), Чыўчынскай (Васіль Лазаронак, Марыя Лазаронак), Шылаўскай і Шушкаўскай (Антон Лейтан, Кацярына Маціеўская)[957]. Паводле заканадаўства, у школах, дзе было не менш як 30 вучняў адной нацыянальнасці, можна было ствараць камплекты. Кастусь Езавітаў заклікаў беларускую грамадскасць і бацькоў патрабаваць беларускіх

---

[952] *Заданьні беларускае асьветы ў Латвіі (гутарка з кіраўніком Беларускага Аддзелу гр. В. Пігулеўскім)*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1927, № 6(4), с. 74.

[953] У. Пігулеўскі, *Беларускі Аддзел пры Міністэрстве Асьветы ў Латвіі за 10 год працы* [у:] *Дзесяць год Беларускае Школы ў Латвіі 1921–1931*, Рыга 1932, с. 30.

[954] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 96 lp.

[955] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 107, л. 40; *Увагі рэдакцыі*, "Голас беларуса" 1926, № 45 ад 8 снежня, с. 4.

[956] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 95 lp.

[957] LVVA, 2125 f., 5 ap., 259 l. 63–64 lpp.

камплектаў у латвійскіх школах. Ажыццяўленне гэтай задачы ён бачыў у згоднай працы беларускага настаўніцтва, арганізацый, бацькоў і Беларускага школьнага аддзела. Асаблівую адказнасць К. Езавітаў ускладаў на бацькоў. Ён падкрэсліваў, што яны маюць усвядоміць патрэбу забеспячэння сваім дзецям асветы на роднай мове, узмацніць аўтарытэт настаўнікаў сярод насельніцтва, уздымаючы нацыянальную і прафесійную планку настаўніцтва, а таксама зрушыць "з мёртвага месца" дзейнасць беларускіх арганізацый у справе змагання за родную школу[958]. На пасяджэнні 20 чэрвеня 1932 г. Рада БША вырашыла спытаць згоды міністра на накіраванне настаўнікаў-беларусаў у школы Агульнага школьнага дэпартамента з вучнямі-беларусамі[959].

У той час, як колькасць беларускіх школ у Латгаліі змяншалася, у Рызе беларуская школьная справа развівалася, што прынамсі часткова кампенсавала паразы ў правінцыі. У дадзены перыяд у сталіцы лічба беларускіх навучальных устаноў павялічылася за кошт новых школ і нават адной гімназіі. Гісторыя стварэння і дзейнасці апошняй будзе асобна разгледжана ў падраздзеле, прысвечаным сярэдняй адукацыі, а зараз варта засяродзіцца на пачатковых школах. Флагманам сталічнай беларускай адукацыі была 1-я Рыжская беларуская школа. Яе педагагічны склад папоўніўся новымі асобамі. Крыніцы дазваляюць падрабязна прасачыць кадравыя змены. 23 кастрычніка 1925 г. школьная рада зацвердзіла настаўнікам каталіцкай рэлігіі кс. Аляксандра Ванага, які змяніў на гэтай пасадзе кс. А. Альшэўскага ў сувязі з выездам апошняга ў правінцыю. 29 верасня 1926 г. настаўнікам гімнастыкі стаў Міхал Краўчанка, а замест кс. А. Ванага каталіцкім катэхетам стаў кс. Пётр Лаўрыновіч. З 1 верасня 1927 г. ён пакінуў школу, а новым настаўнікам каталіцкага Закону Божага быў прызначаны кс. Данат Мурніек. Апошні працаваў у школе да 1 кастрычніка 1930 г., калі быў зменены кс. А. Альшэўскім. 17 кастрычніка 1928 г. школьная рада прызначыла новых настаўнікаў: Я. Камаржынскага і М. Грыўскага, а 13 лістапада – Таісію Мікулу (катэхетка старвераў) і Анастасію Крэйц (ручныя працы). 15 студзеня 1931 г. у школу часова быў накіраваны К. Езавітаў. З 1 верасня 1932 г. Язэп Каяла змяніў М. Грыўскага па пасадзе настаўніка спеваў. У сярэдзіне 1930-х гг. педагагічны калектыў складаўся з С. Сіцько (кіраўнік), К. Езавітава, М. Краўчанкі, Я. Камаржынскага, В. Гайліт, Л. Тэтар, Юзэфы Даль, В. Сімсан, Я. Каяла, А. Крэйц, а. А. Мікалая Македонскага, кс. А. Альшэўскага і Т. Мікулы[960].

---

[958] К. Езавітаў, *Дзьве неадкладныя задачы Беларускага Аддзелу*, "Голас беларуса" 1926, № 18 ад 25 жніўня, с. 2.

[959] Раднік, *Сход Рады Беларускага Адзелу пры Міністэрстве Асьветы*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 2(12), с. 174.

[960] С. Сіцько, *Дзесяцігодзьдзе 1-ае Рыжскае беларускае аснаўное школы, 1923–1933*, Рыга 1934, с. 16.

У сувязі з павелічэннем колькасці вучняў, школа зазнала шэраг унутраных рэарганізацый. У 1928/29 гг. яе наведвала 170 вучняў, а ў 1933/34 гг. ужо 198. З 1 студзеня 1931 г. падрыхтоўчы клас быў падзелены на дзве паралелі. У 1931/32 гг. школа налічвала сем класаў (198 чал.). У 1933/34 гг. школа распачала працу ў 8-класавым складзе. У гэты час яе наведвала 215 вучняў (у I падрыхтоўчым – 22, II падрыхтоўчым – 23, I – 31, II – 33, III – 36, IV – 27, V – 25, VI – 18)[961].

Дзякуючы існаванню школы, штогод новыя групы вучняў атрымлівалі пачатковую асвету. У 1925/26 гг. адчыніўся пяты клас школы. Праўда, далёка не ўсе навучэнцы былі ў стане здаць выпускны іспыт. У выніку частка пакідала школьныя муры без атэстату сталасці. Увесну 1926 г. адбыўся другі выпуск, яе скончылі восем чалавек. Падчас трэцяга выпуску (вясна 1927 г.) атэстаты сталасці атрымала яшчэ сем вучняў, у 1928 і 1929 г. – па 6, у 1930 – 6, у 1931 г. – 3, у 1932 – 3, у 1933 – 9[962]. Выпускнікі былі натуральнай крыніцай папаўнення гімназій, таму ў траўні 1930 г. ТБНЛ прасіла Беларускі школьны аддзел вылучыць сродкі на летнюю пляцоўку пры школе для падрыхтоўкі кандыдатаў у гімназіі[963].

Адна беларуская школа ў горадзе не была ў стане забяспечыць патрэбу сталічнай беларускай супольнасці на атрыманне пачатковай асветы. Беларускі актыў спрабаваў павялічыць колькасць сваіх школ. Яшчэ 16 жніўня 1924 г. з прапановы С. Сахарава ўправа таварыства "Рунь" даручыла старшыні атрымаць ад сталічных улад дазвол на адкрыццё яшчэ адной беларускай школы ў Рызе[964]. Аднак справу запаволіў крызіс беларускай дзейнасці ў Латвіі выкліканы беларускім працэсам. Толькі пасля яго заканчэння, 22 чэрвеня 1925 г., быў скліканы сход бацькоў-беларусаў (30 чал.), якія жылі на Саркандаўгаве. Сход адбыўся пад старшынствам М. Дзямідава і сакратаркі Г. Нікіфароўскай. На пачатку бацькі Язэп Юшкевіч, Якаў Дударэнка і Казімір Пучко ад імя іншых бацькоў-беларусаў заявілі, што праз адсутнасць беларускай школы яны вымушаныя аддаваць дзяцей у рускія і польскія школы, дзе яны русіфікуюцца і паланізуюцца. Яны звярнулі ўвагу на патрэбу адкрыцця беларускай школы ў раёне. Прысутныя ўхвалілі рашэнне звярнуцца да гарадскіх улад па дазвол на адкрыццё беларускай школы. Аднагалосна быў абраны арганізатар і часовы кіраўнік школы, якім стаў М. Дзямідаў. Сход абраў

---

961 С. Сіцько, *Дзесяцігодзьдзе 1-ае Рыжскае беларускае аснаўное школы, 1923–1933*, Рыга 1934, с. 15.

962 *Хроніка,* "Думка беларуса" 1931, № 1, с. 3; *Карэспандэнцыі*, "Думка беларуса" 1931, № 2, с. 2; С. Сіцько, *Дзесяцігодзьдзе 1-ае Рыжскае беларускае аснаўное школы, 1923–1933*, Рыга 1934, с. 12, 14.

963 LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 13 lp.

964 НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 118, л. 2.

настаўніцу (Г. Нікіфароўскую) і склад школьнай рады[965]. Склалі і спіс будучых вучняў – у ім быў 91 чал., у тым ліку 4 латышы[966].

Справа адкрыцця школы замарудзілася: гарадское самакіраванне не давала згоды на яе стварэнне. Урэшце 13 верасня 1925 г. на пасяджэнні ўправы таварыства "Беларуская хата" было вырашана адкрыць прыватную школу, у сувязі з адмовай гарадской культурна-асветнай камісіі Рыгі адчыніць дзяржаўную. Беларускі актыў спасылаўся на 34 заявы бацькоў і 71 вучняў аб прыналежнасці да беларускай нацыянальнасці і жаданні наведваць школу[967]. Установа пачала працу ў будынку сядзібы таварыства "Беларуская хата" па адрасе *Simaņa iela 14/16*. Кіраўніком школы быў прызначаны Р. Плыгаўка, а настаўнікамі працавалі Станіслаў Красневіч, Аляксей Барткевіч, Мікалай Дзямідаў, Сцяпан Сіцько, Галіна Нікіфароўская, Вольга Дзямідава, Люцыя Клагіш[968]. З незразумелых прычын беларускі актыў не ўзгадніў сваіх дзеянняў з мясцовымі ўладамі. 28 верасня 1925 г. інспектар пачатковых школ у Рызе інфармаваў, што падчас інспекцыі знайшоў у сталіцы "нелегальную школу", якую стварыў М. Дзямідаў. Паводле слоў чыноўніка, апошні прыняў у школу ў якасці настаўнікаў С. Красневіча і Г. Нікіфароўскую, якія падманам зваблівалі дзяцей з навакольных польскіх, рускіх і нават літоўскіх школ. Інспектар лічыў гэтыя дзеянні недапушчальнымі[969].

У рэшце рэшт, улады пагадзіліся на функцыянаванне прыватнай школы таварыства "Беларуская хата". Ад 1 верасня 1925 да 1 жніўня 1926 г. школа знаходзілася на ўтрыманні апошняга. У рэальнасці выдаткі на ўтрыманне ўстановы несла беларуская грамадскасць Рыгі, бо таварыства не было ў стане забяспечваць школу. Гэта асабліва адчулася ўзімку 1925/26 гг., калі праз нястачу грошай на апал вучні вымушаны былі сядзелі на занятках у верхняй вопратцы[970]. 1 студзеня 1926 г. рыжскае самакіраванне ўзяло школу на ўтрыманне, што палепшыла яе матэрыяльнае становішча. У другой палове 1920-х гг. школу наведвала 156 вучняў. У гэты час там працавалі настаўнікі К. Езавітаў, Г. Нікіфароўская, С. Красневіч, а на непастаяннай аснове – М. Дзямідаў, Г. Плыгаўка, В. Дзямідава і Л. Клагіш. Кіраўніком быў С. Красневіч[971].

Кіраўнік у першыя гады існавання школы часта змяняўся. У 1926 г. Р. Плыгаўка склаў з сябе абавязкі кіраўніка школы, а 15 жніўня педрада аднагалосна абрала на яго месцы настаўніка беларускай і польскай моваў

---

[965] LVVA, 1632 f., 2 ap., 493 l., 114–115 lpp.

[966] LVVA, 1632 f., 2 ap., 493 l., 116–117 lpp.

[967] LVVA, 1632 f., 2 ap., 492 l., 20 lp.

[968] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 118, л. 2.

[969] LVVA, 1632 f., 2 ap., 492 l., 19 lp.

[970] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 118, л. 2.

[971] *Беларускае жыццё ў Латвіі*, "Голас беларуса" 1926, № 1(19) ад 10 сакавіка, с. 3.

М. Дзямідава[972]. Аднак 6 лістапада 1926 г. Рыжская гарадская школьная ўправа адмовілася зацвердзіць яго на пасадзе. У сувязі з гэтым ён перадаў абавязкі С. Красневічу[973]. На пачатку 1927 г. апошні быў прызначаны справаводам БША. Да часу выбару абавязкі кіраўніка школы выконваў Р. Плыгаўка[974]. 28 лютага 1927 г. педрада школы зноў прапанавала М. Дзямідава на пасаду кіраўніка школы. Гэтым разам, 19 траўня 1927 г., Рыжская гарадская школьная ўправа зацвердзіла яго кандыдатуру[975]. У 1929 г. М. Дзямідаў быў адкліканы з пасады беларускім школьным інспектарам праз фінансавыя злоўжыванні. Выканаўцам абавязкаў кіраўніка стаў К. Езавітаў[976]. На пасяджэнні школьнай рады 12 траўня 1929 г. ён аднагалосна быў абраны кіраўніком школы. Аднак Міністэрства асветы не зацвердзіла яго кандыдатуру, таму К. Езавітаў займаў пасаду часовага кіраўніка[977]. З таго часу адміністрацыя школы выглядала наступным чынам: К. Езавітаў (в.а. кіраўніка), Р. Плыгаўка (старшыня педрады) і Г. Нікіфароўская (справавод)[978]. Новы кіраўнік дбаў пра працоўную дысцыпліну педагогаў, і забеспячэнне школы[979]. Паколькі школа мела запазычанні, у траўні 1929 г. ён прапанаваў школьнай радзе адлічваць на пагашэнне пазыкі сродкі з педагагічнага фонду[980].

У другой палове 1920-х гг. адбыліся кадравыя змены і сярод настаўнікаў. У гэты час у 2-й Рыжскай беларускай пачатковай школе працавалі наступныя педагогі: Г. Нікіфароўская (падрыхтоўчы клас), Р. Плыгаўка, М. Дзямідаў (беларуская мова, краязнаўства), К. Езавітаў (гісторыя, беларуская мова), Бірута Брэдэрман, Міхаіл Грыўскі, Вікторыя Доўгая, Надзея Юзафовіч, а. Мікалай Македонскі, кс. Язэп Гайлевіч і Алаіза Анспок[981]. У склад школьнай рады ўваходзілі: К. Езавітаў, Я. Маракоўскі, Р. Плыгаўка, М. Дзямідаў, Г. Нікіфароўская, К. Сянкевіч, Э. Вільчынскі, Я. Юшкевіч, Н. Юзафовіч, Я. Краўчанка, Б. Брэдэрман, А. Парфееў, Ян Кудраўцоў, У. Пігулеўскі. Медычную апеку вучням забяспечвала доктар Л. Чарнабаева[982].

---

[972] Адначасова педрада школы прасіла БША прызначыць праваслаўным катэхетам а. Мікалая Македонскага, а каталіцкім – аднаго ў ксяндзоў-беларусаў, а ў выпадку іх адсутнасці латыша альбо літоўца. LVVA, 2125 f., 5 ap., 57 l., 48 lp.

[973] LVVA, 2125 f., 5 ap., 57 l., 63 lp.

[974] *Зьмены ў Рыскіх беларускіх пачатковых школах*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1927, № 5(3), с. 70.

[975] LVVA, 2125 f., 5 ap., 57 l., 95, 102 lpp.

[976] Кастусь Езавітаў быў прыняты на працу ў школе ў лютым 1927 г., калі замест С. Красневіча быў прызначаны настаўнікам гісторыі і беларускай мовы. LVVA, 2125 f., 5 ap., 57 l., 95, 102 lpp.

[977] LVVA, 2125 f., 5 ap., 195 l., 42 lp.

[978] The *Hoover Institution*, Yezovitov papers.

[979] LVVA, 2125 f., 5 ap., 195 l., 112 lp.

[980] LVVA, 2125 f., 5 ap., 195 l., 49 lp.

[981] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 119, л. 32; LVVA, 2125 f., 5 ap., 195 l., 97 lp.

[982] LVVA, 2125 f., 5 ap., 195 l., 3 lp.

Нястачы ў ахвотных наведваць школу не было, пра што сведчыць заўважны рост колькасці вучняў. Бацькі, якія жадалі, каб іх дзець былі прынятыя ў школу, мусілі звярнуцца да кіраўніцтва з заявай: "*Лічачы сябе беларусам/беларускай і жадаючы вучыць сваіх дзяцей на сваёй роднай мове, прашу прыняць майго сына/дачку ў НН класу кіруемай Вамі 2-й Рыжскай Мястовай Беларускай асноўнай школы. Усе весткі аб маёй сямейцы да гэтага далучаюцца*"[983]. У 1927/28 г. у школе адбыўся першы выпуск. У 1929/30 гг. ахвотных вучыцца ў ёй налічвалася каля 200 вучняў, а ў 1931/32 гг. – каля 350. Кіраўніцтва школы рупілася, каб яе наведвала як мага больш вучняў-беларусаў. 8 верасня 1929 г. К. Езавітаў разаслаў беларускім настаўнікам Латгаліі ліст з прапановай пашырыць сярод тамтэйшых беларусаў інфармацыю пра існаванне сталічнай школы. Ён заклікаў пераконваць латгальскіх беларусаў, якія пераязджалі ў Рыгу, аддаваць дзяцей у 2-ю Рыжскую беларускую школу. Наведвала школу шмат вучняў з аддаленых раёнаў горада. У сувязі з гэтым 10 лютага 1927 г. школьная рада вырашыла стварыць інтэрнат[984]. На думку беларускага актыву, гэта рабіла школу прывабнай для вучняў, якія паходзілі не з сталіцы[985]. Беларускі школьны аддзел асігнаваў на ўтрыманне інтэрната 160 латаў. Аднак 18 лістапада 1927 г. Рада БША адмяніла рашэнне, разважыўшы, што вучні з аддаленых раёнаў будуць дабірацца ў школу за грашовую дапамогу на даезд і вопратку для найбяднейшых вучняў[986].

Спецыфікай сталічнай школы было тое, што яе вучні, у адрозненні ад латгальскіх вяскоўцаў, нярэдка паходзілі з сем'яў, якія ў штодзённым жыцці

---

[983] LVVA, 2067 f., 1 ap., 364 l., 537 lp.

[984] К. Езавітаў наступным чынам хваліў школу ў лісце да знаёмага: "*Паважаны Грамадзянін. Дужа часта бацькі вучняў, а таксама і вучні правінцыяльных беларускіх школ пераязджаюць на жыццё ў Рыгу і пры гэтым не ведаюць, што ў Рызе ёсць нашыя школы. Дзеля карысці беларускае нацыянальнае меншасці ў Латвіі дужа патрэбна і карысна будзе шырока паведаміць вясковае беларускае грамадства аб існаванні беларускіх школ у Рызе і аб ходзе працы ў гэтых школах. Перасылаючы пры гэтым 2 абвесткі нашае школы дужа просім Вас адну з іх вывесіць у Вашае школе, а другую асабіста прачытаць тым сялянам. Або вучням, аб якіх Вы ведаеце, што яны выязджаюць на працу і жыццё ў Рыгу. Звярніце ўвагу бацькоў і вучняў на тое, што пры школе існуе інтэрнат, а гэта значa што вучні могуць жыць пры школе. Гэта асабліва важна для сірот, якіх няма каму ўтрымліваць, а таксама і для незаможных вучняў, якіх мы тутака ў інтэрнаце падтрымаемо. Падручнікі і школьныя прылады наша школа ведае вучням безграшова. Дзеля таго, што ў большасці нашых вясковых школ няма V I VI клясы, мы можамо прыняць у нашу школу і змясціць у інтэрнаце пры ёй тых вучняў, што скончылі IV клясу Вашых школ і жадаюць вучыцца ў V I VI клясах. У Рызе ў гэтым годзе адчыняецца беларуская гімназія, а таму здальнейшыя з насланых да нас вясковых вучняў, па аканчанні нашае школы, змогуць паступіць у Рыжскую гімназію. Заняткі ў гімназіі будуць ісці ўвечары і гэта дасць магчымасць вучыцца ў ёй нават тым, якія ўдзень будуць мець якую-колечы службу або працу. Часовы кіраўнік школы, К. Езавітаў*". LVVA, 2125 f., 5 ap., 195 l., 108 lp.

[985] LVVA, 2125 f., 5 ap., 11 l., 21 lp.

[986] LVVA, 2125 f., 5 ap., 57 l., 109–110, 123 lpp.

не карысталіся беларускай мовай[987]. І школьнае кіраўніцтва намагалася даць навучэнцам тое, чаго яны не маглі атрымаць ад бацькоў – веданне роднай мовы. На вывучэнне беларускай мовы і літаратуры рабіўся асаблівы акцэнт. На занятках вывучалася творчасць Я. Баршчэўскага, В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, Я. Купалы, Я. Коласа, А, Гаруна, Ф. Аляхновіча, Ц. Гартнага, М. Чарота[988]. У школе ставілі спектаклі *Чорт і баба*, *Модны шляхцюк* (К. Каганец), *Збянтэжаны Саўка* (Л. Родзевіч). Падчас калядных ялінак спявалі беларускія народныя песні. Усё гэта рабілася, каб вучні лепей ведалі літаратурную мову, а таксама каб узняць узровень іх нацыянальнай свядомасці[989].

12 траўня 1929 г. школьная рада 2-й Рыжскай беларускай школы вырашыла звярнуцца ў БША з просьбай вылучыць сродкі на стварэнне дзіцячага садка[990]. К. Езавітаў абгрунтоўваў гэта наступным чынам (15 кастрычніка 1929 г.): "*Дзеці дашкольнага веку незаможных беларускіх рабочых з Чырвонай Дзвіны, Мюльграбену і Купфнільсона ўзростам у 3–4–5 год з'яўляюцца прычынаю вялікага клопату для нашых бацькоў і нашае школы. Справа ў тым, што большасць матак працуе на фабрыцы, а дзеці без дагляду, або даглядаць іх павінны старэйшыя дзеці, вучні нашае школы. У апошнім выпадку яны не маюць магчымасці хадзіць у школу і астаюцца недавукамі. Ёсць з гэтага становішча адзін выхад: гэта аддаць дзяцей малодшага веку ў дзіцячы сад, дзе-б яны былі да 3–4 гадзін пад даглядам вучыцелькі, пакуль маць прыйдзе з працы. Таму ўжо ў мінулым і нават яшчэ ў запрошлым годзе бацькі школы і Школьная Рада прасілі Беларускі Аддзел, каб былі адпушчаны сродкі на адчыненне на Чырвонай Дзвіне беларускага дзіцячага саду. Грошы былі спачатку асігнаваны, а потым накіраваны на іншыя патрэбы і ў мінулым годзе беларускія дзеці зноў асталіся без дзіцячага саду. У выніку гэтага некаторыя бацькі былі змушаны накіраваць сваіх дзяцей у латышскі дзіцячы сад. Але там гутарка з дзецьмі, спевы і гульні вядуцца на латышскай мове. Дзеці нашы спачатку доўга не разумеюць нічога, а потым патроху пачынаюць усваіваць латышскую мову, але затым забываюць сваю родную мову. Здараецца гэта таму, што дзеці і бацькі прыходзяць дахаты позна, стомленыя, ім не да гутарак, дзяцей кладуць хутчэй спаць, а зрана зноў накіроўваюць у латышскі дзіцячы сад. Праз два гады гэткага адведвання латышскага дзіцячага сада дзіцёнак набіраецца лытышскіх слоў, развіццё сваёй роднай мовы спыняецца і ён фактычна аблатышваецца. Такі дзіцёнак для нас ужо страчаны з боку нацыянальнага, бо ў нашу школу ён пайсці не можа, а павінен пайсці*

[987] LVVA, 2125 f., 5 ap., 195 l., 54 lp.
[988] LVVA, 2125 f., 5 ap., 195 l., 71 lp.
[989] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 119, л. 40.
[990] LVVA, 2125 f., 5 ap., 195 l., 117 lp.

ў латышскую школу. І мы ўжо наглядаем у цэлым шэрагу выпадкаў, што старэйшыя дзеці вучацца ў нашай школе, а малодшыя накіроўваюцца ў школу латышскую. Пытанне аблатышвання беларускіх незаможных дзяцей асабліва востра стаіць у Рызе, і трэба ў гэтым годзе прыняць у гэтай справе рашучыя крокі, бо інакш нашы школы ў Рызе праз некалькі год могуць змізарнець, а там і зусім загінуць. Справа можа быць ратавана толькі праз адчыненне дзіцячага сада. Агульны сход бацькоў 2 Рыжскай беларускай асноўнай школы, які адбыўся пры 50 удзельніках 13-X-1929, заслухаўшы даклад у гэтай справе, ухваліў прасіць Беларускі Аддзел і Раду Беларускага Аддзелу, каб у гэтым годзе пры школе абавязкова быў адчынены Беларускі дзіцячы сад і каб на гэтую справу былі асігнаваны належныя сродкі. Прысылаю Вам, грамадзянін Кіраўнік, смету на ўтрыманне беларускага дзіцячага сада ў 1929/30 навучальным годзе, прашу адпусціць нам дапамогу на дзіцячы сад у суме 1600 латаў. У наступным годзе, мы спадзяёмся, што дзіцячы сад гэты будзе ўзяты на ўтрыманне горада"[991].

Праз адсутнасць грошай дзіцячага садка адчыніць не ўдалося, але педагагічная рада 25 чэрвеня 1931 г. пастанавіла адчыніць пры 1-й і 2-й школах дзіцячыя пляцоўкі. Бацькі маглі аддаваць туды дзяцей дашкольнага веку (5–10 гадоў)[992]. Кіраўніком пляцоўкі ў 1-й школе была прызначана Вера Бялінская[993]. На пляцоўку 1-й школы было запісана 48 дзетак, якія тройчы ў дзень атрымлівалі гарачую ежу. Дзеці займаліся карагодамі, спевамі, ручнымі вырабамі. Пляцоўка атрымала 200 латаў з БША і 350 ад настаўнікаў 1-й школы[994]. У 1933 г. беларускі сталічны актыў зрабіў новую спробу стварыць пры школах дзіцячыя садкі ТБНЛ. Аднак пачаў працу толькі адзін – на Саркандаўгаве (*Simana iela 7/9*). Кіравала ім Эмілія Казак-Казакевіч[995]. Садок утрымліваў Беларускі школьны аддзел[996]. Настаўніцтва 2-й школы па меры магчымасці дасылала яму ахвяраванні. Напрыклад, у красавіку 1934 г. педагогі прызначылі на яго ўтрыманне 466 латаў. Сродкі паходзілі са школьнага фонду, скарбнікам якога была Г. Нікіфароўская. Апрача таго, бацькі вучняў сабралі ад студзеня па красавік 1934 г. яшчэ 557 латаў[997]. У снежні 1934 г. настаўнікі школы ахвяравалі на патрэбы садка амаль 185 латаў[998]. У гэты час у садку знаходзілася 15 малых[999].

---

991 LVVA, 2125 f., 5 ap., 195 l., 114 lp.

992 LVVA, 2125 f., 5 ap., 196 l., 79 lp.

993 *Хроніка беларускага жыцьця у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 2(12), с. 176.

994 *Хроніка беларускага жыцьця ў Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 4(14), с. 209.

995 *Хроніка беларускага жыцьця у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 6(23), с. 354.

996 LVVA, 2125 f., 5 ap., 259 l., 72 lp.

997 НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 121, л. 44.

998 НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 121, л. 46.

999 LVVA, 2125 f., 5 ap., 33 l., 3 lp.

Поспехам сталічнага беларускага актыву было стварэнне ў Рызе трэцяй пачатковай школы. Адчувалася патрэба школы для дарослых: у Рыгу ў пошуках хлеба ехала ўсё больш латгальскіх і ілукштанскіх беларусаў, якія толькі часткова былі пісьменнымі. Гэтых людзей цікава характарызаваў К. Езавітаў: "Хто пахадзіў зіму, хто дзве, а хто і зусім не змог адведваць школу"[1000]. Заканадаўства Латвіі дазваляла існаванне вячэрніх асноўных школ для дарослых, куды маглі паступаць асобы (ад 16 гадоў і больш), якія з розных прычын не атрымалі асветы. Школы маглі існаваць пры наяўнасці 30 вучняў[1001]. Беларускі актыў скарыстаўся гэтым. У 1927 г. намаганнямі ТБНЛ была створана Рыжская беларуская прыватная дадатковая школа для дарослых (кіраўнік Я. Кастылюк). Заняткі пачаліся 15 лютага 1927 г., а большасць вучняў склалі асобы ў веку 17–23 гадоў. Навучанне адбывалася ўвечары (18.00–22.00 гадз.) у будынку 2-й школы[1002]. Настаўнікамі былі Р. Плыгаўка, Н. Юзафовіч, Г. Нікіфароўская, А. Родзька, А. Вевэрбрантс[1003]. Школьная праграма складалася з 22 лекцыйных гадзін у тыдзень. У першы год працы ў школу запісалася 50 вучняў у веку ад 17 да 55 гадоў. Аднак у рэальнасці заняткі наведвала не больш як 20 чал., паколькі большасць навучэнцаў складала рабочая моладзь, якой даводзілася працаваць у тры змены. Навучальны працэс ішоў цяжка праз стракаты склад вучняў. Навучальны матэрыял даводзілася прапрацоўваць на занятках, паколькі вучні не мелі часу рабіць хатнія заданні. Настаўнікі працавалі ў гэтай школе ў другую змену, скончыўшы працу ў 2-й школе. Гэта акалічнасць адмоўна ўплывала на іх працаздольнасць. Беларускі бок наракаў на тое, што Рыжская гарадская школьная ўправа спачатку марудзіла з адкрыццём школы, а потым адмаўлялася даваць матэрыяльную дапамогу. У выніку заробак настаўнікаў быў нязначны[1004]. Аднак у 1930 г. школу ўзяло на ўтрыманне гарадское самакіраванне.

Акрамя праграмы пачатковай школы, частка вучняў на жаданне атрымлівала электратэхнічную падрыхтоўку. У школе быў электратэхнічны аддзел, які ў 1930/31 гг. быў перафарміраваны ў самастойную школу (Рыжскую дадатковую беларускую асноўную школу з электратэхнічным ухілам), якую рыжскае

[1000] К. Езавітаў, *Асьветныя патрэбы беларусаў у Рызе*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1927, № 3(1), с. 26.

[1001] *Настаўнікі, адкрывайце вячэрнія школы для дарослых!* "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 3(13), с. 194.

[1002] Кастусёнак, *Зацьверджаньне новае беларускае школы*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1927, № 4(2), с. 42.

[1003] *Сьпіс беларускіх школ і настаўніцтва ў Латвіі ў бягучым 1928–29 навучальным годзе*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1929, № 9(1), с. 62.

[1004] *Справаздача Цэнтральнага Праўленьня*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1928, № 8(1), с. 112–113; *Беларуская пачатковая школа на Чырвонай Дзьвіне у Рызе*, "Голас беларуса" 1926, № 19 ад 1 верасня, с. 5.

самакіраванне ўзяло на ўтрыманне. Гэтым самым была створана адзіная ў той час беларуская прафесійная школа ў Латвіі[1005].

За час існавання школы яе скончылі 18 вучняў, а 4 – электратэхнічны аддзел[1006]. У апошні год існавання ўстановы (1933/34 гг.) яе наведвалі 42 вучні, якіх вучылі 6 настаўнікаў[1007].

Пра маштаб беларускай пачатковай адукацыі ў Рызе дае ўяўленне агульная вучнёўская статыстыка. У 1933/34 гг. у чатырох беларускіх пачатковых школах Рыгі навучалася 561 вучняў і працавала 30 настаўнікаў[1008]. У 1932/33 гг. 1-ю Рыжскую беларускую асноўную школу скончылі 10 вучняў, Рыжскую вячэрнюю беларускую асноўную школу для дарослых – 11, Рыжскую дадатковую школу з электратэхнічным ухілам – 5[1009].

Беларускае настаўніцтва шчыльна супрацоўнічала. Здараліся сітуацыі, калі адны і тыя ж педагогі працавалі ў розны час у розных школах. Інтарэсы ўсіх беларускіх сталічных школ абараняў кіраўнік БША У. Пігулеўскі як іх прадстаўнік у Рыжскай гарадской камісіі асветы. Яму кіраўнікі беларускіх школ накіроўвалі просьбы аб падтрымцы кандыдатур новых настаўнікаў. Апрача таго, рыжскае беларускае настаўніцтва мела права дэлегаваць прадстаўніка ў Рыжскую гарадскую школьную ўправу. Напрыклад, у 1927 г. ім быў М. Дзямідаў, а ў 1928 г. – К. Езавітаў[1010]. У сталіцы рэгулярна адбываліся нарады настаўнікаў беларускіх школ. 6–7 чэрвеня 1928 г. у будынку 1-й школы адбылася нарада, у якой узяло ўдзел 27 чал. (прэзідыум – К. Езавітаў, М. Дзямідаў, Я. Шчорс). Арганізатары планавалі склікаць настаўніцкую канферэнцыю, але праз нязначную колькасць удзельнікаў вырашылі, што мерапрыемства атрымае статус нарады[1011].

Падагульняючы дынаміку развіцця беларускай школьнай справы ў латвійскай дзяржаве ў разгляданы час, належыць адзначыць, што мясцовыя

[1005] *У Латвіі*, "Родны край" № 23 ад 18 лістапада 1933 г., с. 6.

[1006] Краснадзьвінец, *Выпускны акт у Рыскай беларускай дадатковай школе*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 2(12), с. 175.

[1007] LVVA, 2125 f., 5 ap., 33 l., 3 lp.

[1008] LVVA, 2125 f., 5 ap., 33 l., 3 lp.

[1009] *Хроніка беларускага жыцьця у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 5(22).

[1010] Кастусь Езавітаў быў абраны ў Рыжскую гарадскую школьную ўправу 3 сакавіка 1928 г. на сходзе педрад 1-й і 2-й школ. На гэтым сходзе прысутнічалі: Я. Шчорс, Г. Нікіфароўская, А. Родзька, У. Пігулеўскі, Л. Клагіш, Н. Юзафовіч, М. Краўчанка, С. Сіцько і К. Езавітаў. Апошні перамог іншых кандыдатаў з вынікам 6 галасоў. Для параўнання Р. Плыгаўка і М. Дзямідаў атрымалі па адным голасе. Удзельнікі лічылі, што беларускі прадстаўнік павінен абараняць інтарэсы беларускага настаўніцтва, кіруючыся пастановамі педрадаў, патрабаваць павелічэння памяшканняў для 1-й і 2-й школ, прыняцца на дзяржаўнае ўтрыманне дадатковай школы, рупіцца аб асігнаванні як мага большых сродкаў на патрэбы беларускіх школ. LVVA, 2125 f., 5 ap., 22 l., 3 lp.

[1011] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 67–68 lpp.

актывісты мелі падставы, каб непакоіцца. Колькасць беларускіх школ была значна меншай, чым у папярэдні перыяд (1921–1925 гг.). Больш за тое, яна скарачалася ад году да году. Разам з 1925 па 1933 гг. лічба беларускіх школ і камплектаў скарацілася з 36 да 25. Большасць школ Беларускі школьны аддзел страціў у 1929/30 і 1930/31 гг., калі іх стала менеў амаль на траціну. Пераважная большасць страчаных школ знаходзілася на Лудзеншчыне. У гэтым павеце беларусы страцілі аж 15 школ[1012]. Амаль поўнае знікненне беларускіх школ на Лудзеншчыне толькі ў нязначнай ступені кампенсавала адкрыццё некалькіх прыватных школьных устаноў[1013]. Пачынаючы з 1929 г., выспай беларускай адукацыі ў Латгаліі з'яўлялася Даўгаўпілшчына[1014]. Зусім іншыя працэсы назіраліся ў сталіцы. У дадзены перыяд у Рызе адбыўся ўздым беларускай школьнай справы, што належыць тлумачыць сістэматычным ростам колькасці беларусаў у горадзе. У 1933/34 гг. сістэма беларускай адукацыі ў Латвіі складалася з двух гімназій, 22 пачатковых школ (у тым ліку трох прыватных) і аднаго камплекту[1015].

Пераход беларускіх школ у іншую нацыянальную юрысдыкцыю з'яўляўся часткай шырэйшага кантэксту, які тычыўся становішча беларускай меншасці ў Латвіі. Узровень падтрымкі насельніцтвам беларускіх школ адлюстроўваў стан нацыянальнай свядомасці беларускамоўнага латгальскага сялянства. Сведчыць аб гэтым факт, што закрыццё беларускіх школ адбывалася адначасова з памяншэннем лічбы грамадзян Латвіі, якія дэкларавалі прыналежнасць да беларускай нацыянальнасці.

Пачатковыя школы

У разгляданы перыяд асновай беларускай адукацыі ў Латвіі па-ранейшаму былі пачатковыя школы. У гэтым падраздзеле прааналізуем іх фінансавае і матэрыяльнае становішча, навучальны працэс, дамо характарыстыку настаўнікам і вучням, а таксама разгледзім культурнае жыццё ў школьных мурах.

Фінансаванне. Несуцяшальныя для беларусаў вынікі перапісаў 1925 і 1930 гг. выклікалі скарачэнне дзяржаўнай падтрымкі беларускіх асветных устаноў. Беларускія школы ўпершыню адчулі гэта ў 1925 г., калі колькасная вага беларускай меншасці ў агульналатвійскай нацыянальнай статыстыцы ўпала амаль удвая. Адпаведна, выдаткі на беларускія школы таксама скараціліся ў 1924/25 гг. – з 95 840 латаў (у 1924/25 гг.) да 58 467 (у 1925/26 гг.).

[1012] LVVA, 2125 f., 5 ap., 333 l., 60–64 lpp.

[1013] LVVA, 2125 f., 5 ap., 333 l., 64 lp.

[1014] LVVA, 2125 f., 5 ap., 259 l., 71 lp.

[1015] LVVA, 2125 f., 5 ap., 33 l., 3 lp.

Гэта дало беларускаму актыву падставу сцвярджаць, што ўлады падтрымліваюць польскія і рускія школы коштам беларускага[1016]. У наступныя гады сітуацыя не палепшылася. У гэты час памер дзяржаўных сродкаў на беларускія школы вызначаўся сістэматычным памяншэннем колькасць беларусаў у афіцыйных статыстыках і эканамічным крызісам. У 1928/29 гг. бюджэт Беларускага школьнага аддзела быў скарочаны на 5% у параўнанні з папярэднім годам[1017]. У сувязі з гэтым, 21 верасня 1928 г. Рада БША звярнулася да міністра асветы, прапануючы перагледзець рашэнне, бо, акрамя школ, на ўтрыманні Беларускага школьнага аддзела знаходзіліся настаўніцкія курсы і тэатральныя трупы[1018].

Атрыманыя ад міністэрства грошы Беларускі школьны аддзел размяркоўваў з улікам матэрыяльнага стану школ і бягучых патрэб. Па пасяджэнні Рады БША 19 кастрычніка 1929 г. было вырашана зарэзерваваць 300 латаў на падтрымку новых школ і камплектаў. Адначасова было вырашана не вылучаць сродкаў гарадскім школам, якія ў параўнанні з вясковымі знаходзіліся ў лепшым становішчы. Сродкі размяркоўваліся ў адпаведнасці з наступнай градацыяй: 1) школы, якія патрабуюць значнай дапамогі; 2) школы, якім пагражае закрыццё альбо пераход у іншую нацыянальную юрысдыкцыю; 3) школы, якія працуюць у нармальных умовах; 4) школы, якія існуюць дзякуючы "мясцовым абставінам і асаблівасцям настаўніцкага персаналу"[1019].

Пэўнае ўяўленне наконт бюджэту беларускіх школ можа даць разгляд некалькіх прыкладаў падзелу сродкаў за асобныя гады. 20 чэрвеня 1932 г. адбылося пасяджэнне Рады БША, на якім быў прадстаўлены бюджэт на 1932/33 г. у памеры 71 707 латаў. З гэтай сумы на ўтрыманне аддзела было прызначана 8 904 латаў, на настаўніцкія курсы – 8 745, на Даўгаўпілскую беларускую гімназію – 47 738, на прыватныя школы – 3 888, на летнія настаўніцкія курсы – 220[1020]. У 1933/34 гг. бюджэт беларускіх школ склаў 62 181 лат, з якіх 8 038 было вылучана на ўтрыманне БША, 6 500 – на настаўніцкія курсы, 45 351 – на Даўгаўпілскую беларускую гімназію, 2 284 – на прыватныя школы[1021].

[1016] LCVA, f. 368, ap. 1, b. 33, l. 278.

[1017] У гэты час на падручнікі для беларускіх школ было выдаткавана 2,5 тыс. латаў, на тэатр – 5 тыс., на настаўніцкія курсы – 14 тыс.

[1018] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 76 lp.

[1019] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 10 lp.

[1020] Раднік, *Сход Рады Беларускага Адзелу пры Міністэрстве Асьветы*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 2(12), с. 174.

[1021] З грошай на прыватныя школы атрымалі: Рыжская школа ТБНЛ – 450 латаў, Гараўская школа ТБНЛ – 484, дзіцячы садок таварыства "Беларуская хата" ў Даўгаўпілсе – 300, інтэрнат пры Прыдруйскай школе – 200, а астатнія грошы пайшлі на ўтрыманне дзіцячых пляцовак у Рызе. *У Радзе Беларускага Аддзелу пры Міністэрстве Асьветы*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 5(22), с. 330.

Дапамога беларускім школам па-ранейшаму ішла і па лініі Культурнага фонду Латвіі. У 1930/31 гг. ён перадаў беларускім установам 1 653 латаў, якія былі размеркаваныя наступным чынам: Даўгаўпілская беларуская гімназія – 165, Рыжская беларуская гімназія – 165, настаўніцкія курсы – 166, беларускія пачатковыя школы – 1 157[1022]. Беларускія школы маглі разлічваць на часовую падтрымку з боку інспектарату школ. Напрыклад, у 1928–1930 гг. Зарэцкая школа мела бюджэт у 1 072 латаў, з якіх толькі 55 атрымала з БША, 24 – з павятовай управы і ад выручкі з вечарыны, а рэшта сумы паходзіла з інспектарату школ[1023].

Матэрыяльнае становішча. У разгляданы час матэрыяльнае становішча многіх школ не змянілася ў параўнанні з папярэднім перыядам. У канцылярыі Беларускага школьнага аддзела захоўваецца шмат лістоў кіраўнікоў школ, якія скардзіліся на цяжкія ўмовы.

У складаным матэрыяльным становішчы знаходзілася беларуская пачатковая школа ў Даўгаўпілсе, пра што сведчыць ліст яе кіраўніка ў 1926 г.: "*У Дзвінскай пачатковай беларускай школе будынак, а таксама і ўвесь інвентар школы – зусім кепскія. Памяшканне школы дужа молое, усе класы праходныя, дзверы папсаваныя, няма электрычнасці, няма залы (...), а ўзімку [вучні] таўкуцца ў класах, бо больш няма дзе ім знаходзіцца. Цяжка і вучням і вучыцялём працаваць у такой школцы. Аб інвентары дык смешна і казаць. Да гэтаго часу ў школе няма гадзіннікаў, нягледзячы но тое, што школа існуе ўжо 4 гады. Сталы класовыя ўправа прыслала такія, што брыдка глядзець*"[1024]. Віну за стан школы беларускі бок ускладаў на Даўгаўпілскую гарадскую думу, што, як меркавалася, непрыхільна ставілася да беларушчыны. У ліпені 1929 г. кіраўнік школы пісаў у БША, што каля 60% вучняў незаможныя і патрабуюць матэрыяльнай дапамогі. Ён прасіў прызначыць 500 латаў на інтэрнат пры школе, бо восем вучняў паходзілі з навакольных вёсак[1025].

Ёсць падставы меркаваць, што ў Даўгаўпілскай школе па віне персаналу панавалі кепскія санітарныя ўмовы. Сведчыць пра гэта ліст школьнага інспектара (17 лютага 1927 г.) на імя кіраўніка школы, у якім чытаем: "*Два разы, што я быў у школе, я знаходзіў памяшканне і класы бруднымі і ў класах шмат смецця, на што і звяртаў Вашу ўвагу. Дзеля таго, што элементарныя прынцыпы школьнае працы вымагаюць захоўвання ў школе наўзорнай чыстаты, прапаную яшчэ раз Вам і класным настаўнікам звярнуць на гэта*

[1022] LVVA, 2125 f., 5 ap., 401 l., 64 lp.

[1023] LVVA, 2125 f., 5 ap., 107 l., 42 lp.

[1024] Дземенскі, *Становішча пачатковай беларускай школы у Дзьвінску*, "Голас беларуса" 1926, № 12 ад 14 ліпеня, с. 1.

[1025] LVVA, 2125 f., 5 ap., 399 l., 15 lp.

сур'ёзную ўвагу і катэгарычна патрабаваць захоўвання чыстаты ў школе як ад стоража, так і ад вучняў"[1026].

Не выглядала добрым становішча беларускай школы ў Лудзы[1027]. Класныя пакоі ў ёй не мелі вокнаў, на што падчас наведвання звярнуў увагу міністр асветы. 22 сакавіка 1925 г. школьная рада вырашыла звярнуцца ў Раду міністраў з просьбай адрамантаваць школьныя пакоі. З цягам часу тэхнічны стан школы не палепшыўся. З пратакола пасяджэння школьнай рады ад 30 кастрычніка 1929 г. вынікае, што стан будынка быў крытычны: 1) сходы і падлога гнілі; 2) класныя пакоі па-ранейшаму не мелі вокнаў, таму заняткі нават удзень адбываліся пры газніцы; 3) памяшканне школы кепска ацяплялася, таму заняткі адбываліся пры тэмпературы +6–7 градусаў. Рада лічыла, што школа не можа далей знаходзіцца ў гэтым будынку, паколькі яго стан быў небяспечны для здароўя вучняў і настаўнікаў. У жніўні 1929 г. інспектар беларускіх школ, а таксама 7-асабовая дэлегацыя бацькоў, наведалі Лудзенскую гарадскую ўправу з просьбай пра новае памяшканне для школы, але просьбу пакінулі без увагі. Тады школьная рада вырашыла ўласным коштам наняць новы будынак у Лудзы[1028]. З лістапада 1929 г. школа знаходзілася ў доме Эпімах-Шыпілаў (вул. Нагорная 12). У 1930 г. дырэкцыя Лудзенскай школы інфармавала аб тым, што школа не мае сродкаў на ўтрыманне будынка ў належным стане. Віну за гэта кіраўнік школы ўскладаў на гарадское самакіраванне, якое скараціла школьны бюджэт. Сітуацыя змянілася ў сакавіку 1931 г., калі падчас выбараў у органы мясцовага самакіравання беларусы правялі ў гарадскую думу свайго кандыдата. У выніку быў ухвалены бюджэт, які задаволіў беларускі бок[1029]. Восенню 1931 г. школа пераехала ў новы будынак (вул. Латгальская, 54), у якім раней месцілася канцылярыя беларускай гімназіі. Інфармацыі пра тэхнічны стан новага будынка не захавалася[1030].

Аднак найбольш складаныя ўмовы былі ў вясковых школах. У некаторых не хапала інвентару і мэблі. У шматлікіх выпадках школьная мэбля (парты, лаўкі) былі выраблены бацькамі вучняў. Многія школы знаходзіліся ў сялянскіх хатах, спалучаных з гаспадарчымі пабудовамі. Усё гэта ўскладняла навучальны працэс. Большасць вясковых школ месцілася ў пабудовах, якія мелі праблемы з ацяпленнем. Таму, згодна з распараджэннем Міністэрства асветы (1933 г.), заняткі спыняліся ў 1-х класах, калі тэмпература паветра падала

[1026] LVVA, f. 2125, 5 ap., 127 l., 10 lp.

[1027] LVVA, 2125 f., 5 ap., 155 l., 119 lp.

[1028] LVVA, 2125 f., 5 ap., 155 l., 198 lp.

[1029] *Мы вытрывалі!,* "Думка беларуса" 1931, № 2, с. 3.

[1030] Люцынец, *5-цігодзьдзе Люцынскае беларускае пачатковае школы*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1927, № 4(2), с. 42–43; С. Казека, *Лудзенская беларуская асноўная 6-ціклясовая школа за 10 год працы – з 1922 па 1932 год*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 2(12), с. 163–165.

да -20, у 2-х і 3-х класах – да -22, а ў старэйшых – да -25. Гэта не тычылася школ, якія мелі інтэрнаты – там заняткі не спыняліся[1031].

Варта прыгледзецца да сітуацыі ў некаторых вясковых школах. У сакавіку 1928 г. кіраўнік Келаўскай школы А. Махноўскі інфармаваў, што ў яго школе "*ўсе парты, за выключэннем аднэй, зроблены пры адчыненні школы (3 гады назад) самімі бацькамі для часовага карыстання і таму, не кажучы аб гігіенічных вымогах, зусім развальваюцца. На шматлікія запросы аб новых партах ні Павятовая, ні Валасная Управы ніякага адказу ў працягу 3-х гадоў не далі. Што да памешкання, то пры даных варунках ніякае пажаданне не можа быць здзейсненым за адсутнасцю лепшых памешканняў для школы ў даным раёне. З знаходзячыхся пад школай памешканняў лепшае на бягучы год гаспадаром не будзе здана пад школу. Заганы меншага памешкання ў тым, што яно малое і прахадное (падчас лекцыяў часта ходзяць узад і ўперад гаспадары, бо праз клас адзіны ход у іх памешканне)*"[1032]. Тым часам кіраўнік Лупандаўскай школы А. Дварэцкі пісаў: "*Што датычыцца інвентару, то патрэбны: партрэт Прэзідэнта, флаг і класная дошка. Аб гэтым я ўжо пісаў валасной управе. Лічу не лішнім дабавіць, што школы Прыдруйскай вол.[асці] атрымліваюць зімой сыры апал*"[1033].

У снежні 1928 г. інспектар Я. Кастылюк наступным чынам паведамляў пра становішча 2-й Прыдруйскай школы: "*Заняткі ў школе вядуцца кепска. У школе няма раскладу лекцый на 1928/29 вуч.год, а расклад за мінулы год у такім становішчы, што ім карыстацца немагчыма. Вучыцелі працуюць па чарзе: адзін дае адну лекцыю, а другі другую. Школьныя дапамогі раскіданы і запылены, парты не папраўлены; адкідныя вярхі ад іх адарваны і бадзяюцца пад партамі, якія вучыцель мог бы і сам паправіць улетку. Класа брудная, замест крэсла ў клясе ляжыць калода. На маю прапанову паставіць у класе крэсла, а калоду вынесці, вучыцель Дубавік адказаў, што пры школе крэслаў няма, але ёсць толькі яго прыватныя, якія ён баіцца паставіць у класу, каб вучні не зламалі. Вучыцель Мэжак выкладае беларускія прадметы на расейскай мове: чым вучні незадаволены. Канцылярыя не ў парадку. Няма журналу для запісу агульнага ліку вучняў, для запісу вучняў па класах, для запісу лекцыяў*"[1034]. Сітуацыя ў школе прынцыпова не змянілася і пазней, пра што сведчаць вынікі рэвізіі школьнага інспектара: "*Вучыцелі працуюць у адным пакоі. Праца вядзецца непрадуктыўна, асабліва вучыцелем Мэжакам, які выкладае па-расейску прадметы: прыродазнаўства, агульную геаграфію, матэматыку; вучні ім незадаволены, яго тлумачэнні не разумеюць і пакідаюць школу (...)*

[1031] LVVA, 6845 f., 2 apr., 19 l., 233 lp.
[1032] LVVA, 2125 f., 5 ap., 37 l., 15 lp.
[1033] LVVA, 2125 f., 5 ap., 37 l., 69 lp.
[1034] LVVA, 2125 f., 5 ap., 171 l., 45 lp.

на мае запытанні, чаму ў падгатоўчай клясе мала вучняў, кіраўнік школы Дубавік адказаў, што маленькія дзеці баяцца ісці ў школу адны праз вёску Вайвады, калі настане зіма, дык яны будуць хадзіць разом з старэйшымі. Я патрабаваў у кіраўніка школы, каб ён па чарзе з вуч. Мэжакам праводзіў вучняў да вёскі Вайвады, ад чаго ён адмовіўся, зазначыўшы, што ён даволі працуе з 9 да 3 гадзін. У школе знайшоў такі самы непарадак, які быў 22–23 кастрычніка. Паміж іншым вучні ў класе сядзяць уперамежку, дзе каму спадабаецца, а не па класах, што кепска адбіваецца пры выкладанні, асабліва ў дашкольнай класе. Другі пакой, які я запрапанаваў кіраўніку выдзеліць пад класу, каб вучыцелі не займаліся ў адным пакоі і не турбавалі адзін другога, завалены рэчамі кіраўніка школы: у адным кутку бульба, у другім бураки, у трэцім бочкі з рознымі рэчамі"[1035].

Беднасць беларускіх школ была абумоўлена яшчэ і тым, што большасць з іх не мела ўласных зямельных надзелаў. Некаторыя настаўнікі лічылі, што гэта было прычынай слабой сувязі паміж настаўніцтвам і мясцовым сялянствам: не маючы зямлі, настаўнік на час вакацый быў вымушаны пакідаць школу, каб працаваць на ўласнай гаспадарцы[1036].

У найгоршым матэрыяльным становішчы знаходзіліся прыватныя школы, якія не мелі рэгулярнай дзяржаўнай субсідыі. Беларускі актыў рупіўся, каб як мага хутчэй пераводзіць іх на дзяржаўнае ўтрыманне. Яскравым прыкладам з'яўляецца Шылаўская школа, бюджэт якой складаўся са сродкаў ТБНЛ (50%) і бацькоў вучняў (50%). Апошнія бралі на сябе гаспадарчыя выдаткі школы. Гэтых сродкаў, аднак, не хапала на тое, каб школа нармальна функцыянавала. Нястача ставіла пад пагрозу само існаванне ўстановы. Ратуючы сітуацыю, кіраўніцтва ТБНЛ звярнулася ў Беларускі школьны аддзел з просьбай пра дадатковыя сродкі на ўтрыманне школы[1037]. БША выдаткаваў на патрэбы школы 200 латаў, што дазволіла ўстанове працягнуць працу. 24 сакавіка 1927 г. ТБНЛ звярнулася ў Лудзенскую павятовую школьную ўправу з просьбай узяць на сябе ўтрыманне школы. Рада Беларускага школьнага аддзела 1 кастрычніка 1927 г. даручыла кіраўніку БША перамовы з мясцовымі ўладамі пра дапамогу школе[1038]. У выніку ў лістападзе 1927 г. школу ўзяла на ўтрыманне Пасіенская валасная ўправа[1039].

Пытанне фінансавання прыватных школ разглядалася на пасяджэнні Рады Беларускага школьнага аддзела 22 траўня 1933 г. Кастусь Езавітаў абвінаваціў

[1035] LVVA, 2125 f., 5 ap., 171 l., 45 lp.

[1036] Вучыцель, *Вясковыя школы ня маюць кавалачка зямлі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1927, № 5(3), с. 71.

[1037] LVVA, 2125 f., 5 ap., 211 l., 113 lp.

[1038] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 49 lp.

[1039] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 54 lp; *Справаздача Цэнтральнага Прауленьня*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1928, № 8(1), с. 110–111.

кіраўніка аддзела У. Пігулеўскага ў тым, што ён не цікавіцца лёсам прыватных школ[1040]. На чарговым пасяджэнні 28 траўня 1933 г. Рада БША і кіраўніцтва ТБНЛ заснавалі пры кіраўніцтве апошняга стыпендыйны фонд, у які кожны беларускі настаўнік і чыноўнік мусіў адлічваць 0,5% месячнага заробку[1041].

Дзяржаўнай дапамогі было недастаткова, каб вырашыць матэрыяльныя праблемы. Школы мусілі самі шукаць магчымасці зарабіць. Прасцей было тым, што валодалі нейкай нерухомасцю. Пашыраным спосабам паляпшэння матэрыяльнага становішча школы і падтрымкі найбяднейшых вучняў была арганізацыя дабрачынных мерапрыемстваў. Напрыклад, у лістападзе 1928 г. кіраўніца Зарэцкай школы Алена Ліпень пісала інспектару беларускіх школ: "*У даручанай мне школе 4 лістапада г.г. адбылося пасяджэнне Школьнай рады, на якім гутарылі аб падысканні сродкаў для бяднейшых вучняў, таму што гэты год для сялян вельмі цяжкі і ад урадавага інспектара атрымана ўсяго 40 лат на 82-х вучняў. Пасяджэнне рады пастанавіла: 17 лістапада г.г. паставіць вечарыну. Ад імя Школьнае рады маю гонар прасіць Вас дапамагчы нам атрымаць з гімназіі кіно на гэты вечар*"[1042].

Трэба падкрэсліць, што беларускія школы ў Рызе мелі лепшыя ўмовы. Яны знаходзіліся ў гарадскіх будынках, значна лепшых за вясковыя. Гэтыя школы маглі здаваць памяшканні ў арэнду іншым арганізацыям, што давала дадатковыя сродкі. У прыватнасці, 2-я Рыжская беларуская школа здала ў арэнду таварыству "Беларуская хата" адзін з паверхаў сваёй сядзібы[1043]. 16 чэрвеня 1929 г. Рада БША вырашыла не даваць рыжскім школам дапамогі з бюджэту на наступны навучальны год, каб болей атрымалі школы ў правінцыі[1044]. Хоць рыжскім школам таксама не заўжды хапала сродкаў. Сведчыць пра гэта факт, што 4 чэрвеня 1933 г. удзельнікі надзвычайнага сходу сяброў ТБНЛ прынялі рашэнне стварыць стыпендыйны фонд на патрэбы дадатковай школы для дарослых, заклікаўшы беларускае настаўніцтва сталіцы і грамадскіх актывістаў адлічваць на карысць фонду па 2% месячнага заробку (а для асоб з дадатковым прыбыткам гэта сума складала 5%)[1045].

Навучальны працэс. У другой палове 1920-х гг. беларускія школы прыстасаваліся да латвійскіх школьных праграм. Накладам Беларускага школьнага

[1040] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 85 lp.

[1041] *Сябром Таварыства Беларускіх вучыцялёў у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 4(21), с. 305.

[1042] LVVA, 2125 f., 5 ap., 109 l., 28 lp.

[1043] *Беларускае жыцьцё ў Латвіі*, "Голас беларуса" 1926, № 31 ад 21 ліпеня, с. 4; LVVA, 2750 f., 1 ap., 7 l., 281–285 lpp.

[1044] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 22 lp.

[1045] *Сябром Таварыства Беларускіх вучыцялёў у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 4(21), с. 305.

аддзела былі надрукаваныя *Праграмы Беларускае Пачатковае Школы у Латвіі* (1925) і *Програма па гісторыі Латвіі для беларускіх пачатковых школ* (1926). Пры БША была створана бібліятэчка з педагагічнымі дапаможнікамі, дзе кожны настаўнік мог бясплатна азнаёміцца з патрэбнай літаратурай[1046]. Праграма іспыту па беларускай літаратуры складалася з наступных тэмаў: 1) Пачатак пісьменнасці ў Беларусі. Еўфрасіння Полацкая; 2) Залаты век беларускай пісьменнасці. Францішак Скарына – яго жыццё і праца; 3) Заняпад беларускай пісьменнасці. Беларусь пад Польшчай, пад Расіяй. Пачатак адраджэння беларускай літаратуры. *Тарас на Парнасе*. Рукапіснае пашырэнне твораў; 4) Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч і яго творы на беларускай мове; 5) Францішак Багушэвіч, яго праца і значэнне для беларускага адраджэння; 6) Янка Купала, яго жыццё, творы і значэнне як адраджэнца; 7) Якуб Колас і яго творы; 8) Максім Багдановіч, яго жыццё, творчасць і значэнне яе для беларускай літаратуры; 9) Цішка Гартны, яго жыццё і творы; 10) Міхась Чарот і яго творы. З'яўленне ў Беларусі пісьменніцкіх аб'яднанняў[1047]. Тым часам, праграма курсу па ўсеагульнай гісторыі ўтрымлівала такія тэмы, як: Славянскія плямёны, з якіх склаўся беларускі народ; З'яўленне варагаў; Полацк і яго саперніцтва з Кіевам; Змаганне беларускіх гарадоў за самастойнасць; Унія дзяржаўная і унія рэлігійная ў Беларусі; Культурнае жыццё ў Беларусі ў 16 ст.;[1048].

У беларускіх школах па-ранейшаму не хапала беларускамоўных падручнікаў. Гэта была адна з галоўных праблем. Калі ў першыя гады існавання школ выкарыстоўваліся дапаможнікі, надрукаваныя за межамі Латвіі, дык з часам гэта рабілася ўсё складаней. Міністэрства асветы неахвотна дазваляла карыстацца віленскімі выданнямі, якія ў пачатку 1920-х гг. былі пашыраныя ў беларускіх школах[1049]. 18 снежня 1926 г. Беларускі школьны аддзел беспаспяхова прасіў міністра дазволіць у беларускіх школах беларуска- і рускамоўныя выданні па гісторыі і геаграфіі[1050].

Усё мацней адчувалася патрэба друкаваць навучальную літаратуру ў Латвіі. У 1926 г. БША атрымаў з Міністэрства асветы 50 тыс. латаў на выданне падручнікаў[1051]. За гэтыя грошы быў выдадзены лемантар К. Езавітава *Беларуская школа. Першая пасьля лемантара кніга для чытаньня ў беларускае асноўнае школе ў Латвіі*, брашуру А. Луцкевіча *Як вучыць у новай школе* і дапаможнік

[1046] LVVA, 2125 f., 5 ap., 77 l., 89 lp.

[1047] LVVA, 2125 f., 5 ap., 57 l., 133 lp.

[1048] LVVA, 2125 f., 5 ap., 57 l., 134 lp.

[1049] LVVA, 3235 f., 6 ap., 196 l., 23 lp.

[1050] У спісе кніг знаходзілася праца Антона Луцкевіча *Агульная гісторыя* і Усевалада Ігнатоўскага *Кароткі нарыс гісторыі Беларусі*, а таксама працы Г. Іванова *Всеобщая история. Древний мир*, Ю. Навасёлава *Первые уроки географии в Латвии*, *География Европы* і інш. LVVA, 1632 f., 2 ap., 495 l., 8 lp.

[1051] LVVA, 3235 f., 6 ap., 196 l., 23 lp.

К. Езавітава *Беларусь у мінулым і сучасным (Канспект пазашкольнаму працаўніку для лекцыяў з чароўным ліхтаром)*.

Нягледзячы на выданне падручнікаў, у беларускіх школах Латвіі па-ранейшаму выкарыстоўвалі замежную літаратуру на роднай мове[1052], падручнікі, якія друкаваліся ў Заходняй Беларусі. 15 лістапада 1929 г. інспектар беларускіх школ прасіў кіраўніка Беларускага школьнага аддзела, які выязджаў у Вільню па падручнікі, падрыхтаваць спіс пажаданняў адносна патрэбнай літаратуры[1053]. У выніку шэраг школ атрымаў па некалькі асобнікаў кнігі *Арытметычны задачнік* (у двух версіях – для настаўнікаў і вучняў) Радаслава Астроўскага, *Беларуская граматыка для школ* Браніслава Тарашкевіча, *Новы лемантар* Янкі Станкевіча[1054]. Акрамя таго, у беларускіх школах Латвіі выкарыстоўваліся іншыя кнігі, атрыманыя ад заходнебеларускіх пабрацімаў, у тым ліку – творы *Сымон музыка* Я. Коласа, *Прынц і жабрак* Марка Твэна, *Пад сінім небам* Наталлі Арсенневай, *Сляпы музыка*, *Вянок* М. Багдановіча, *Арыфметычны задачнік для пачатковых школ* С. Рака-Міхайлоўскага, *Беларускі правапіс* і *Кароткі нарыс гісторыі Беларусі* У. Ігнатоўскага, *Зорачка* А. Смоліч, *Родны край* і *Гісторыя беларускай літаратуры* М. Гарэцкага, *Наша крыніца* Я. Лёсіка, *Практычны расійска-беларускі слоўнік* М. Байкова і М. Гарэцкага і інш.

Такім чынам, у беларускіх школах выкарыстоўваліся падручнікі і дапаможнікі выдадзеныя ў розных месцах, у розны час і рознымі аўтарамі. Асабліва гэта тычылася падручнікаў па беларускай мове. На падставе справаздачы Дудэльскай школы за 1927/28 гг. беларуская мова выкладалася паводле наступных падручнікаў: у падрыхтоўчым класе (6 гадзін у тыдзень) – *Зорка I і II часткі* А. Смоліч і *Беларуская школа* К. Езавітава; у 1-м класе (6 гадзін у тыдзень) – *Беларуская школа* К. Езавітава і *Родны край* М. Гарэцкага, у 2-м класе (5 гадзін у тыдзень) – *Наша крыніца* Я. Лёсіка, *Родны край* II частка М. Гарэцкага, у 3-м класе (4 гадзіны ў тыдзень) – *Родны край* 3 і 4 часткі М. Гарэцкага, *Беларуская граматыка для школ* Б. Тарашкевіча[1055].

Беларускі школьны аддзел рупіўся забяспечыць школы не толькі літаратурай і падручнікамі, але таксама сшыткамі і дзённікамі. У верасні 1926 г. кіраўніцтва БША пісала ў цыркуляры да кіраўнікоў пачатковых школ: "*Пажадана таксама, каб усе беларускія пачатковыя школы перасталі ўжо ўжываць дзённікі для вучняў у чужых мовах, а выпісвалі ўжо маючыяся пры Аддзеле дзённікі на беларускай мове. Дзённікі гэтыя маюць гэткі загаловак: 'Сшыток для запісываньня заданьняў'*"[1056].

[1052] LVVA, 3235 f., 6 ap., 196 l., 248 lp., LVVA, 2125 f., 5 ap., 329 l., 1 lp.

[1053] LVVA, 2125 f., 5 ap., 387 l., 124 lp.

[1054] LVVA, 2125 f., 5 ap., 399 l., 22 lp.; LVVA, 2125 f., 5 ap., 330 l., 16 lp.

[1055] LVVA, 2125 f., 5 apr., 130 l., 29 lp.

[1056] LVVA, 2125 f., 5 ap., 76 l., 6 lp.

Вучні атрымлівалі падручнікі і навучальныя матэрыялы бясплатна, паколькі бацькі не маглі іх набыць. Цяжар закупу неабходнай літаратуры клаўся на плечы настаўнікаў. У архіве Беларускага школьнага аддзела захаваліся лісты кіраўнікоў некаторых школ, якія праз адсутнасць грошай у школьнай скарбонцы ўласным коштам замаўлялі падручнік К. Езавітава *Беларуская школа* ў цвёрдай вокладцы. Напрыклад, так зрабіў кіраўнік Шушкаўскай беларускай школы С. Маціеўскі[1057]. Кіраўнікі школ былі вымушаны прасіць БША выдаткаваць дадатковыя сродкі на падручнікі[1058]. У прыватнасці, дырэктар Прыдруйскай школы 27 верасня 1929 г. пісаў: "*Грошы, якія адпушчаны ўрадавым інспектарам, 30–50 латаў, ледзь хапае на пісьмовыя прылады, 3–4 кнігі. Зараз папоўніць запас кніжак, які не папаўняўся некалькі год і пры IV кл.[асе], які маецца сёлета быць і патрабуе шмат кніжак па прадметах, з тых грошай школа не зможна і прымушана будзе карыстацца 'Зоркай – букваром' для старэйшых класаў*"[1059].

Аднак педагогі не заўсёды былі ў стане забяспечыць вучняў неабходнымі матэрыяламі. Настаўніца адной з беларускіх школ на Пасеншчыне не хавала распачы: "*Проста гора, якая галота ў нашай школе, ды і наагул – у Пасеншчыне! Сяляне незаможныя. Зямлі мала. У гэтым годзе яшчэ, як на тое ліха, няўрод. Вучні не то, што кніжку, але сшыток ды аловак купіць не могуць (...) Купіш сама грыфялёў, алоўкаў, сшыткаў за свае ўласныя грошы, раздаш – ідуць заняткі, а як няма ў самой грошы, дык хоць ты пальцам пішы. Хоць бы скуль-небудзь, якую-небудзь, хаця ж бы самую маленечкую дапамогу магчыма было атрымаць на бяднейшых вучняў. А здольныя ёсць дзеці, і гэтак хочуць вучыцца. Дачуліся, што з некаторых вёсак паехалі вучыцца некалькі чалавек аж у Дзвінскую гімназію, дык плачуць: 'Ніколі нам не пабачыць гімназіі, калі мы ў сваёй школе не можам вучыцца, бо сшытка няма за што купіць'*"[1060]. У 1931 г. настаўніца Савейкаўскай школы Вера Хлебнікава пісала ў БША: "*У звязку з тым, што школа толькі што адчынілася, я прашу як мага хутчэй дапамагчы мне чым можна, бо няма ніякіх сродкаў, каб падтрымаць яе. Вучняў прыблізна можна спадзявацца, што будзе яшчэ больш, але я як у працы з голымі рукамі: няма ні сшыткаў, ні алоўкаў, ні рэчаў, без якіх амаль што немагчыма весці заняткі. Яшчэ раз вельмі прашу дапамагчы грашыма*"[1061]. Акрамя таго, настаўніца прасіла даслаць ёй план лекцый, навучальную праграму, спеўнік, беларускі каляндар, партрэт

[1057] LVVA, 2125 f., 5 ap., 328 l., 33 lp.

[1058] LVVA, 2125 f., 5 ap., 329 l., 45 lp.

[1059] LVVA, 2125 f., 5 ap., 330 l., 8 lp.

[1060] Настаўніца, *Вучні ня могуць купляць ні сшыткоў ні кніжок*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1927, № 5(3), с. 71.

[1061] LVVA, 2125 f., 5 ap., 207 l., 5 lp.

прэзідэнта Латвіі і "якіх-колечы беларускіх пісьм і наогул якія толькі можна вучэбныя дапамогі"[1062].

Нягледзячы на друкаванне новых падручнікаў і выкарыстанне замежных, праблема нястачы навучальнай літаратуры адчувалася цягам усяго перыяду існавання беларускіх школ у Латвіі. Трохі палепшыла сітуацыю выданне ў 1928 г. падручнікаў У. Пігулеўскага *Наш край: зборнік краязнаўства* і *Геаграфія. Курс III кл*. На пасяджэнні Рады БША 19 кастрычніка 1929 г. У. Пігулеўскі прапанаваў прызначыць больш сродкаў на закуп навучальнай літаратуры[1063]. 15 чэрвеня 1932 г. беларуская настаўніцкая канферэнцыя ў Даўгаўпілсе вырашыла стварыць фонд на патрэбы выдання навучальнай літаратуры, у які кожны беларускі настаўнік абавязаны быў уносіць па 24 латы ў год[1064].

У 1933 г. Міністэрства асветы забараніла з 1 жніўня 1934 г. выкарыстанне ў школах нацыянальных меншасцей падручнікаў, якія выйшлі за мяжой. У сувязі з гэтым 22 траўня 1933 г. Рада Беларускага школьнага аддзела ўхваліла пастанову пра падрыхтоўку да друку новых падручнікаў і папрасіла Міністэрства асветы вылучыць адпаведныя сродкі[1065]. Вынікам стала выданне ў 1933 г. падручнікаў Э. Томаса і Ю. Навасёлава *Геаграфія для пачатковых школ*[1066] і О. Сванэ *Кароткая гісторыя Латвіі для беларускіх пачатковых школ* у перакладзе П. Масальскага[1067]. Удзельнікі беларускай настаўніцкай канферэнцыі Даўгаўпілшчыны 18 сакавіка 1934 г. абмеркавалі патрэбу выдаць падручнік па матэматыцы. Было вырашана стварыць падкамісію па яго падрыхтоўцы[1068]. Аднак задума засталася нерэалізаванай.

Завяршаючы агляд галоўных праблем, якія ўскладнялі навучальны працэс у беларускіх школах, належыць звярнуць увагу на яшчэ адну акалічнасць. Навучальны працэс у гарадскіх школах меў асаблівасці, якіх не было ў вёсцы. Напрыклад, вучні Даўгаўпілскай школы наведвалі кінатэатры ў час, калі там дэманстраваліся фільмы для дарослых. У сувязі з гэтым 23 студзеня 1929 г. школьная рада прасіла Даўгаўпілскую гарадскую думу забараніць школьнай моладзі наведваць гэтыя сеансы[1069].

[1062] Тамсама.

[1063] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 9 lp.

[1064] *Конфэрэнцыя беларускіх вучыцялёў у Дзьвінску*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 2(12), с. 170–171.

[1065] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 84 lp.; *У Радзе Беларускага Аддзелу пры Міністэрстве Асьветы*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 5(22), с. 328.

[1066] LCVA, f. 368, ap. 1, b. 33, l. 41; *Хроніка беларускага жыцьця у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 2(9).

[1067] Букацінскі, *Міністэрства асьветы нарэшце распачало справу друкаваньня беларускіх падручнікаў*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 3(200), с. 296.

[1068] LVVA, 2125 f., 5 ap., 14 l., 70 lp.

[1069] LVVA, 2125 f., 5 ap., 127 l., 122 lp.

Настаўнікі. У разгляданы час лічба педагогаў, якія працавалі ў беларускіх пачатковых школах у Латвіі, вагалася ад 63 да 91. Дынаміка колькасці настаўнікаў залежала ад змены колькасці беларускіх школ. Больш падрабязныя звесткі ўтрымлівае дадзеная табліца.

Табліца 38. Колькасць настаўнікаў у беларускіх пачатковых школах у 1925–1933 гг.

Навучальныя гады	Даўгаўпілскі павет	Лудзенскі павет	Даўгаўпілс	Лудза	Краслава	Рыга	Разам
1925/26	32	30	5	7	1	16	91
1926/27	20	25	6	6	1	14	72
1927/28	23	25	6	5	1	11	71
1928/29	22	20	7	6	1	20	76
1929/30	27	23	7	5	1	22	85
1930/31	25	4	9	5	1	21	65
1931/32	25	3	8	4	1	23	64
1932/33	21	1	9	-	-	32	63

Крыніца: LVVA, 2125 f., 5 ap., 333 l., 57 lp.

Колькасць настаўнікаў у школах была розная. Па зразумелых прычынах найбольшыя педагагічныя калектывы існавалі ў 6-годках. Напрыклад, у 1928/29 гг. у Даўгаўпілскай школе працавалі 6 настаўнікаў[1070], у 1-й Рыжскай – 8, у 2-й Рыжскай – 6, у Лудзенскай – 6[1071], у Ляўдарскай – 4. Ва ўсіх астатніх школах працавала па 1–2 настаўнікі[1072].

Сацыяльны, прафесійны і этнаканфесійны склад педагогаў беларускіх пачатковых школ істотна не змяніўся ў параўнанні з папярэднім этапам. Праўда, дзякуючы працы настаўніцкіх курсаў, з часам у мурах беларускіх школ расла колькасць кваліфікаваных настаўнікаў. Аднак па-ранейшаму беларускае настаўніцтва не было маналітным у нацыянальным плане. Частку

[1070] З цягам часу колькасць настаўнікаў у гэтай школе павялічылася. Напрыканцы 1920-х гг. Даўгаўпілскай беларускай пачатковай школай кіраваў А. Барткевіч, а настаўнікамі працавалі А. Райко, К. Александровіч, Я. Кастылюк, С. Сахараў, Ул. Балкоўскі, Б. Станкевіч, П. Масальскі, М. Фёдарава, Сафія Карнавухава, Я. Зэйгліш. LVVA, 2125 f., 5 ap., 127 l., 40 lp.

[1071] За 10 гадоў існавання Лудзенскай школы (1922–1932 гг.) у ёй працавала каля 20 настаўнікаў, сярод якіх былі: Р. Плыгаўка, Лідзія Мурнік, Лілія Шмід, Фінаген Фёдараў, Феафан Барысовіч, Антон Урбш, Аляксей Гадлеўскі. Люцынец, *5-цігодзьдзе Люцынскае беларускае пачатковае школы*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1927, № 4(2), с. 42–43; С. Казэка, *Лудзенская беларуская асноўная 6-ціклясовая школа за 10 год працы – з 1922 па 1932 год*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 2(12), с. 163–165.

[1072] LVVA, 2125 f., 5 ap., 33 l., 3 lp.

педагогаў складалі прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей, перадусім латышы. Гэта тлумачылася тым, што многія настаўнікі-беларусы не мелі кваліфікацыі навучання латышскай мове. Настаўнікі-латышы, не ведаючы беларускай мовы, на занятках карысталіся рускай. Пры гэтым акрамя латышскай мовы яны выкладалі іншыя прадметы, а часамі былі кіраўнікамі школ. Некаторыя беларускія дзеячы былі занепакоеныя такім становішчам, вінавацячы іх у "русіфікацыі" вучняў-беларусаў. Кастусь Езавітаў лічыў, што з беларускіх школ павінны быць звольненыя настаўнікі-латышы, якія, не валодаючы беларускай мовай, размаўлялі з вучнямі па-руску. Дзеяч адзначаў: "*У рэшце рэшт выходзе, што вучыцель-латыш навучае беларускіх дзяцей расейскай мове, і такім чынам, адбываецца фактычна не латышызацыя, а русіфікацыя беларускага жыхарства праз працу вучыцеля-латыша*"[1073]. Ён патрабаваў, каб Беларускі школьны аддзел дабіваўся ад Міністэрства асветы адхілення настаўнікаў-латышоў ад працы ў беларускіх школах і замены іх асобамі, якія праслухалі Рыжскія дзяржаўныя беларускія настаўніцкія курсы[1074].

Як ужо адзначалася, у першыя гады існавання беларускіх школ у Латвіі не хапала настаўнікаў з веданнем беларускай мовы. Не знікла праблема і ў наступныя гады. Некаторыя педагогі не выкарыстоўвалі беларускай мовы ў зносінах з вучнямі і іх бацькамі. Яскрава сведчаць пра гэта пастановы Рады БША. 29 кастрычніка 1926 г. яна прыняла рашэнне аб узмацненні нацыянальнай свядомасці беларускага настаўніцтва і паляпшэнні нацыянальнага выхавання ў беларускіх школах. У дакуменце чытаем: "*Не прымаць больш у беларускія школы настаўнікаў, якія ня ведаюць беларускае мовы. Прапанаваць усім вучыцялём перайсці ўва ўсіх беларускіх школах да выкладання ўсіх прадметаў выключна на беларускай мове. Размовы беларускіх вучыцялёў з вучнямі і паміж сабой павінны адбывацца на беларускай мове*"[1075]. Ад таго, ці гаварыў настаўнік па-беларуску, наўпрост залежала ступень нацыянальнай свядомасці вучняў і бацькоў. Ведаючы гэта, 16 ліпеня 1927 г.

[1073] К. Езавітаў, *Дзьве неадкладныя задачы Беларускага Аддзелу*, "Голас беларуса" 1926, № 18 ад 25 жніўня, с. 2.

[1074] Вось як пісаў К. Езавітаў: "*Апрача свайго спецыяльнага прадмета, латышскае мовы, гэтыя настаўнікі-латышы маюць у беларускіх школах яшчэ і іншыя абавязкі: выкладаюць некаторыя агульныя прадметы, спаўняюць абавязкі класных настаўнікаў-выхавацеляў і часта-густа нават кіруюць беларускімі школамі. Зусім зразумела, што, не ведаючы беларускае мовы, гэтыя вучыцялі ўсю сваю працу вядуць на расейскай мове (...) Такім чынам, у працягу пяцігадовага існавання беларускае школы ў Латвіі, вучыцялі-латышы ў беларускіх школах з'яўляліся дэнацыяналізуючым нашых дзяцей элементам і правадзілі ў нас русіфікацыю. Ёсць сярод гэтых вучыцялёў-латышоў і такія, якія не толькі не знайшлі патрэбы хоць трошкі пазнаёміцца з беларускаю моваю, але ставіліся і ставяцца да яе яўна негатыўна, нават варожа*". К. Езавітаў, *Яшчэ адна даўно насьпеўшая праблема*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1927, № 6(4), с. 78.

[1075] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 35 lp.

Рада БША ўхваліла пастанову пра выкарыстанне беларускай мовы ў школьных мурах, у якой адзначалася: "*Дзеля таго, што адсутнасць нацыянальнае свядомасці ў бацькоў з'яўляецца вялікай перашкодай для выкладання ўсіх прадметаў на беларускай мове, Рада Упраўлення пастанавіла даручыць кіраўнікам школ і вучыцялям звярнуць асаблівую ўвагу на большае нацыянальнае ўсведамленне бацькоў вучняў і тым палепшыць варункі выкладання на беларускай мове*"[1076].

Веданне настаўнікамі беларускай літаратурнай мовы было звязана з іх стаўленнем да беларушчыны і заангажаванасцю ў нацыянальна-грамадскую дзейнасць. Беларускі актыў клапаціўся пра нацыянальнае аблічча настаўніцтва. У студзені 1927 г. кіраўніцтва Беларускага школьнага аддзела звярнулася з заклікам "Кіраўнікам усіх беларускіх пачатковых школ і беларускім вучыцялям камплектаў" – каб настаўнікі не абмяжоўваліся выключна педагагічнай працай, але таксама ўключаліся ў грамадскую дзейнасць на карысць нацыянальнага ўсведамлення насельніцтва. У грамадскай пасіўнасці педагогаў кіраўнік БША бачыў адну з галоўных прычын скарачэння колькасці беларускіх школ. Ён заклікаў настаўніцтва актыўней узяцца за працу, падкрэсліваючы, што яно "*павінна заўсёды памятаваць, што яно з'яўляецца адзіным правадыром культуры і прасветы ў адсталую і бедную беларускую масу*"[1077]. Пасіўнасць вясковых настаўнікаў ён тлумачыў з'яву аб'ектыўнымі фактарамі сцвярджаючы, што нацыянальна-культурная актыўнасць беларускага настаўніцтва на правінцыі выклікае з боку мясцовай адміністрацыі насцярогу, што "за кожным беларускім словам, за кожнай беларускай песняй крыецца нейкі антыдзяржаўны

[1076] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 45 lp.

[1077] Варта цалкам прывесці гэты дакумент: "*5 гадоў існавання беларускае школы ў Латвіі – тэрмін часу, які павінен быў узмацніць у беларускіх масах самую ідэю беларускае школы і разам з тым павінен быў пераканаць беларускае вучыцельства, што яго заданні не могуць і не павінны абмяжоўвацца вузкімі рамкамі выключна педагагічнае працы. Калі латвійскае вучыцельства наагул павінна прымаць і прымае чынны ўдзел у грамадскім жыцці Латвіі, то беларускае вучыцельства апрача таго павінна заўсёды памятаць, што яно з'яўляецца адзіным правадыром культуры і прасветы ў адсталую і бедную беларускую масу. На жаль, факты выдоўлівання з школьнае сеткі некаторых беларускіх школ здараюцца пасля 5-ці гадоў існавання Беларускага Аддзела і сведчаць аб тым, што некаторыя элементы беларускага вучыцельства не ўяўляюць сабе ўсёй паважнасці і адказнасці іх працы. Зразумела, што пры тых абставінах, у якіх беларускае вучыцельства павінна было весці сваю цяжкую працу апошнія 2 гады, на гэтых элементах вучыцельства ляжыць толькі частка іхняе віны – гэта ўласная інертнасць. Прыняўшы на сябе кіраванне Беларускім Аддзелам пры Міністэрстве Прасьветы і маючы надзею, што дэмакратычны Ўрад Латвійскае Рэспублікі задаволіць усе законныя правы беларускае меншасці ў Латвіі, я заклікаю беларускае вучыцельства выявіць максімум энергіі ў педагагічнай і грамадскай працы, накіраванай з прадуманай тактоўнасцю ў бок выхавання ў беларускім жыхарстве разумення сваіх грамадзянскіх абавязкаў перад Латвійскай Рэспублікай і сваіх шырокіх правоў беларускае меншасці ў Латвіі*". LVVA, 2125 f., 5 ap., 77 l., 36 lp.

ўчынак". На думку дзеяча, такое стаўленне адміністрацыі выклікала сярод значнай часткі беларускага настаўніцтва апатыю і "зрабіла з настаўнікаў машыны, механічных асоб, абсалютна не маючых сувязі з жыхарствам і культурна-нацыянальных уплываў на яго"[1078].

Тэстам на адданасць настаўнікаў нацыянальнай справе з'яўляліся іх паводзіны і дэкларацыі. Беларускі актыў адмоўна ставіўся да таго, што некаторыя педагогі не жадалі аддаваць сваіх дзяцей у беларускія школы. 18 ліпеня 1927 г. Рада Беларускага школьнага аддзела разгледзела гэтае пытанне і пастанавіла лічыць недапушчальным, каб беларускія настаўнікі аддавалі дзяцей у іншанародныя школы[1079]. У адной з пастаноў Рады БША чытаем: "*Рада вызнае абавязковым навучанне дзяцей беларускіх вучыцялёў у беларускай школе і лічыць недапушчальным навучанне ў школах іншых нацыянальнасцяў*"[1080]. 25 верасня 1927 г. Даўгаўпілскі аддзел ТБНЛ запатрабаваў пазбавіць настаўніка Г. Якубовіка права працаваць у беларускіх школах, бо ён не жадаў аддаваць сваіх дзяцей у беларускую гімназію. Рада Беларускага школьнага аддзела рэкамендавала яму прыняць да ведама пастанову ТБНЛ, а ў адваротным выпадку яму пагражала страта працы ў беларускай школе ў 1928/29 гг.[1081] 17 снежня 1927 г. Рада БША разгледзела справу настаўніка Канстанціна Дубавіка, які таксама не жадаў аддаваць сваіх дзетак у беларускую гімназію. Рада прыняла пастанову, што настаўнік, калі не зменіць меркавання, будзе пазбаўлены працы ў сістэме беларускіх школ[1082].

Беларускія дзеячы спадзяваліся, што "абеларушванне" настаўніцтва адбудзецца, дзякуючы падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы новых педагагічных кадраў на Рыжскіх дзяржаўных беларускіх настаўніцкіх курсах і летніх курсах беларусазнаўства. БША сачыў, каб настаўнікі праслухалі вышэйзгаданыя курсы. 19 кастрычніка 1929 г. Рада Беларускага школьнага аддзела разгледзела справу настаўнікаў, якія не праслухалі курсаў беларусазнаўства. Было вырашана, што асобы, якія не здалі іспыт па беларусазнаўстве, не атрымаюць права выкладаць беларускую мову, гісторыю і геаграфію Беларусі[1083].

Нягледзячы на гэтыя захады, беларускасць настаўнікаў па-ранейшаму пакідала жадаць лепшага. 23 верасня 1930 г., падчас беларускай настаўніцкай канферэнцыі ў Рызе, П. Журкоўскі звярнуў увагу на стан беларускай мовы ў школах, адзначаючы, што там паўсюдна пануе расейшчына, а настаўнікі

[1078] *Заданьні беларускае асьветы ў Латвіі (гутарка з кіраўніком Беларускага Аддзелу гр. В. Пігулеўскім)*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1927, № 6(4), с. 76–78.

[1079] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 44 lp.

[1080] LVVA, 2125 f., 5 ap., 70 l., 57 lp.

[1081] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 55 lp.

[1082] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 54 lp.

[1083] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 10 lp.

як паміж сабой, так і з вучнямі размаўляюць па-руску: "*У нацыянальным адношанні мы як быццам кагосьці баімся. Тыя вучні, якія канчаюць школы таксама не маюць выразнага беларускага твару. Нашы пачатковыя школы не маюць выразнага нацыянальнага твару (...) Калі ў нас не будзе нацыянальнага выхавання, дык нашто нам такія школы*"[1084]. Падобнага меркавання прытрымліваўся кс. А. Альшэўскі, які адзначыў, што "*духу беларускага ў нас няма. Калі гэтак будзе, дык чаго ж мы шумім? Нам трэба беларусамі быць па духу, а не па пашпарту. Не трэба нам колькасці, а патрэбна якасьці. Трэба падымаць і нацыянальны дух, і дысцыпліну*"[1085].

Нацыянальная пасіўнасць настаўніцтва абмяркоўвалася на старонках беларускай прэсы. На недастатковую прысутнасць у школах роднай мовы звярталі ўвагу беларускія актывісты. На старонках аднаднёўкі "Шлях праўды" (кастрычнік 1930 г.) чытаем: "*Стаўшы нейкім 'рамесленым', вучыцельства пачало хварэць блізарукасцю, прыпыніўшы грамадскую і палітычную працу сярод беларускага грамадзянства, не разумеючы па сваёй прастаце, што гэта вядзе да самагубства*"[1086]. На старонках выдання адзначалася, што многія настаўнікі, знайшоўшы ўтульнае месца ў беларускіх школах, забыліся пра тое, што яны з'яўляюцца прадстаўнікамі беларускай інтэлігенцыі і не праяўлялі ініцыятывы ў грамадскай дзейнасці[1087]. У іншай публікацыі сцвярджалася, што многія вясковыя настаўнікі не рупяцца пра беларускую справу, а чакаюць, што кіраўнік Беларускага школьнага аддзела дапаможа ім атрымаць працу ў горадзе, дзе лепшыя фінансавыя ўмовы. Таксама аўтар пісаў, што ў шэрагах беларускага настаўніцтва ёсць прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей "*прыйшоўшыя да беларусаў тады, калі ў беларускіх установах з'явіліся вольныя вакансіі, – гэтыя людзі за грошы часова назвалі сябе беларусамі, пакуль будуць есці беларускі хлеб*"[1088]. У 1931 г. рэдакцыя газеты "Думка беларуса" выказвала занепакоенасць тым, што настаўнік Пустынскай школы С. Махноўскі звярнуўся да вучняў па-руску, а падчас дзіцячага свята вучні спявалі рускія песні, а не беларускія[1089]. На недахоп нацыянальна загартаваных беларускіх педагагічных кадраў у Латвіі звяртала ўвагу заходнебеларуская

[1084] LVVA, f. 2125, ap. 5, l. 92, 13 lp.

[1085] LVVA, 2125 f., 5 ap., 92 l., 13 lp.

[1086] *Мяшчанства беларускага вучыцельства,* "Шлях праўды" 1930, 24 X, с. 3.

[1087] У адным з артыкулаў чытаем: "*Такія факты, як выдаванне кіраўніком Беларускага аддзела газеты ў чужой беларусам мове 'Трудовая мысль', між тым, як у беларускай мове ніякай газеты не выдаецца, прамовы беларускага дэпутата і кіраўніка Беларускага аддзела на сходах і мітынгах сярод беларускага сялянства ў роднай яму мове, яскрава гаворыць усім аб няшчырым м непаважным адношанні самога кіраўніка да ўсёй беларускай справы*". *Мяшчанства беларускага вучыцельства,* "Шлях праўды" 1930, 24 X, с. 3.

[1088] *Адказ гр. Пігулеўскаму на яго інтэрв'ю*, "Шлях праўды" 1930, № ад 24 кастрычніка, с. 1.

[1089] *Ад рэдакцыі*, "Думка беларуса" 1931, № 2, с. 3.

прэса. На старонках віленскай “Беларускай крыніцы” з’явілася зацемка, аўтар якой лічыў, што на дапамогу беларускім школам у Латвіі павінны прыйсці польскія і пражскія беларусы з ліку маладых кадраў[1090]. На практыцы гэта не магло ажыццявіцца, бо латвійскія ўлады неахвотна дазвалялі працаваць настаўнікам з замежным грамадзянствам.

Выкарыстанне ў беларускіх школах рускай мовы непакоіла і латвійскія ўлады, якія інфармавалі, што нават у пачатку 1930-х гг. навучанне ў некаторых школах ішло па-руску насуперак пратэстам Беларускага школьнага аддзела. Пра тое, што ў мурах беларускіх школ часам вучылі па-руску, сведчаць назіранне Даўгаўпілскай павятовай школьнай управы. У сувязі з гэтым 12 верасня 1931 г. кіраўніцтва БША разаслала кіраўнікам беларускіх школ загад даць звесткі наконт мовы выкладання ў кожнай школе[1091]. 5 ліпеня 1933 г. Рада БША абмеркавала выкарыстанне рускай мовы ў рыжскіх беларускіх школах. На прапанову У. Пігулеўскага рада пастанавіла нагадаць настаўнікам, што ў беларускіх школах навучанне мусіць ісці па-беларуску[1092].

Архіўныя дакументы дазваляюць падрабязна ўявіць штодзённае жыццё і праблемы педагогаў. З крыніц вынікае, што ў асяроддзі настаўнікаў здараліся канфлікты. Некаторыя вырашаліся з удзелам кіраўніцтва школы і Беларускага школьнага аддзела. Прывядзём найбольш яскравыя прыклады. 5 верасня 1926 г. настаўніца Даўгаўпілскай беларускай школы Антаніна Якубецкая напісала скаргу ў БША на кіраўніка школы Канстанціна Александровіча. Жанчына пратэставала супраць рашэння Даўгаўпілскай гарадской управы пра яе звальненне і абранне К. Александровіча кіраўніком школы. 3 верасня школьная рада (С. Сахараў, К. Александровіч, А. Райко, Я. Кастылюк, А, Барткевіч, В. Кастаблоцкая) сапраўды прыняла рашэнне звольніць А. Якубецкую. На думку жанчыны, прычынай звальнення было непаразуменне паміж ёй і К. Александровічам[1093]. Яна вінаваціла апошняга ў тым, што пасля адыходу папярэдняга кіраўніка А. Якубецкага школа пачала “працаваць ненармальна”. З яе слоў вынікала, што К. Александровіч не прымаў у школу каталікоў, сцвярджаючы, што яны палякі і мусяць ісці ў польскую школу. Жанчыне не спадабалася, што новы кіраўнік зрабіў ёй вымову за тое, што яна выпадкова

[1090] *Biełarusy ŭ Łatwii*, “Беларуская крыніца”, № 25 ад 13 жніўня 1930 г., с. 2.

[1091] LVVA, 2125 f., 5 ap., 87 l., 46 lp.

[1092] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 88 lp.

[1093] Настаўніца абскардзіла рашэнне школьнай рады. Яна лічыла паводзіны К. Александровіча шкоднымі і неадпаведнымі адзначаючы: “*Прыходзіцца прыўдумацца над тым, што творыцца ў школе. Чыя-та цёмная рука працуе ўва-усю, каб зруйнаваць школу*”. Настаўніца пералічвала прыклады, паводле яе, нетактоўнасці апанента ў дачыненні да яе асобы. Жанчына пераконвала, што К. Александровіч запатрабаваў ад школьнай рады звальнення яе са школы (“ці я, ці Якубецкая”). Яна таксама сцвярджала, што падчас сходу школьнай рады К. Александровіч выкрыкнуў: “Досіць панства Якубецкіх!”. LVVA, 2125 f., 5 ap., 176 l., 162–163, 174 lpp.

завяла ў царкву двух вучняў-каталікоў. Акрамя таго, настаўніца вінавациła К. Александровіча ў тым, што ён, нібыта, хацеў выслаць дэлегацыю (А. Якубецкая, А. Барткевіч) на ўрачыстасць 5-годдзя існавання польскай школьнай справы. Яна пісала, што ў Даўгаўпілскай школе адбываецца нешта нячыстае, доказам чаго было жаданне школьнай рады (29 жніўня 1926 г.) звольніць яе з працы як іншаземку нягледзячы на ўрадавы дазвол працаваць у школе[1094].

Скора вырашыць справу не ўдалося. 3 верасня С. Сахараў на пасяджэнні школьнай рады прапанаваў паінфармаваць БША пра тое, што А. Якубецкая звольненая не праз сваё грамадзянства, а пасля канфлікту з К. Александровічам[1095]. У сваю чаргу кіраўнік Беларускага школьнага аддзела лічыў К. Александровіча асобай неадпаведнай для кіравання школай і прапанаваў замяніць яго настаўнікам А. Барткевічам[1096]. У верасні 1926 г. БША звярнуўся ў школьную раду Даўгаўпілскай школы з просьбай патлумачыць звальненне А. Якубецкай. Непаразуменне паміж К. Александровічам і А. Якубецкай не было адзінай канфліктнай сітуацыяй у мурах гэтай школы. У 1929 г. Рада Беларускага школьнага аддзела разглядала непаразуменне паміж настаўнікамі Канстанцінам Александровічам і Марыяй Фёдаравай. Кіраўніцтва БША лічыла, што абое не выконвалі належным чынам службовых абавязкаў[1097].

Можна меркаваць, што ў шэрагу выпадкаў крыніцай сварак паміж педагогамі былі матэрыяльныя прычыны. Доказам гэтага з'яўляюцца справы, якімі напрыканцы 1920-х гг. давялося займацца інспектару беларускіх школ Я. Кастылюку. Ён мусіў лагодзіць канфлікты паміж настаўнікамі ў Даўгаўпілскай, Карклінаўскай і 2-й Прыдруйскай школах. Ва ўсіх трох выпадках адбыліся кадравыя змены, якія не спадабаліся частцы настаўнікаў. Напрыклад, інспектар хацеў зняць з пасады кіраўніка 2-й Прыдруйскай беларускай школы Канстанціна Дубавіка. На яго месца ён жадаў прызначыць Вільгельма Мірановіча, аднак супраць выступілі настаўнікі і некаторыя сябры Даўгаўпілскай школьнай павятовай управы[1098]. У выніку К. Дубавік кіраваў школай, але атмасфера ў школе была не найлепшая. Сведчыць пра гэта ліст настаўніка В. Мірановіча інспектару Я. Кастылюку, у якім чытаем: "*Ня хочыць нам кіраўнік II Прыдруйскай школы даць памешкання, а адпраўляе нас у 'зелень' спраўляць 'Дзень Беларускае Культуры'. Цяпер вечарамі сцюдзёна, а галоўнае, надыдзе ноч і нікому не хочыцца ўпоцемку*

[1094] LVVA, 2125 f., 5 ap., 126 l., 88 lp.
[1095] LVVA, 2125 f., 5 ap., 126 l., 90 lp.
[1096] LVVA, 1632 f., 2 ap., 495 l., 46 lp.
[1097] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 3 lp.
[1098] LVVA, 2125 f., 5 ap., 387 l., 41 lp.

мярзець, а ў лепшым выпадку бараніцца ад камароў. Просім Вас зрабіць уплыў ці іншае што!"[1099].

Паміж настаўнікамі здараліся непаразуменні ідэалагічнага характару. У 1927 г. суд гонару Рады БША разглядаў канфлікт паміж настаўнікамі А. Якубецкім і К. Александровічам у сувязі з артыкулам першага ў газеце "Голас беларуса" (№ 37 ад 1.1.1926)[1100]. Справу ўдалося залагодзіць. У выніку А. Якубецкі публічна папрасіў прабачэння, а К. Александровіч – адклікаў судовы пазоў[1101].

Увагі заслугоўвае стан працоўнай дысцыпліны настаўнікаў беларускіх школ. Яна ацэньвалася школьным кіраўніцтвам па-рознаму. 28 сакавіка 1927 г. кіраўнік Беларускага школьнага аддзела выдаў цыркуляр кіраўнікам школ, загадаўшы настаўнікам адказней ставіцца да педагагічных абавязкаў, надаваць больш увагі статыстыкам паспяховасці вучняў[1102]. У адным з абежнікаў інспектар беларускі школ патрабаваў ад кіраўнікоў школ належнага выканання абавязкаў. У прыватнасці, некаторыя кіраўнікі запознена высылалі справаздачы ў БША, затрымлівалі раздачу атрыманай літаратуры вучням[1103]. Паводле назіранняў інспектара, некаторыя настаўнікі, працуючы з вучнямі, выкарыстоўвалі неадпаведныя з педагагічнага пункту гледжання метады. У Пітэрскай беларускай школе ўзнікла праблема з настаўніцай Еўфрасіняй Маркоўскай, якая ў студзені 1929 г. была прызначана на пасаду насуперак жаданню інспектара беларускіх школ. У звароце ў Беларускі школьны аддзел ён пісаў: "*Пры рэвізіі Пітэраўскай школы 7-га лютага і 6-га сакавіка гг. я знайшоў, што вучыц.[ельніца] Маркоўская працуе дрэнна, выкладае па-расейску, у школе адчуваецца адсутнасць здаровае дысцыпліны; каб заставіць вучня слухацца, яна ўжывае такія кары, якія даўным-даўно адкінуты педагагічнай літаратурай і забаронены ў школах Латвіі. Пры рэвізіі школы 6-га сакавіка*

[1099] LVVA, 2125 f., 5 ap., 59 l., 3 lp.

[1100] У артыкуле А. Якубецкі абвінавачіў К. Александровіча ў заняпадзе беларускай пачатковай школы ў Даўгаўпілсе. Аўтар лічыў, што з моманту заняцця апошнім пасады кіраўніка школы распачаўся яе заняпад. Ён падкрэсліваў, што К. Александровіч, нібыта, належыць да польскай арганізацыі "Ochronka" і з'яўляецца шваграм двух уплывовых сябраў польскай фракцыі ў Даўгаўпілскай гарадской думе, якія варожа ставяцца да беларускай школы. Аўтар рабіў выснову: "*Патрэбна сучаснаму кіраўніку Беларускага аддзела і прадстаўнікам беларусаў (гр. Сахараву і гр. Райко) у Дзвінскай Гарадской Думе падумаць аб будучыні школы і прыняць энергічныя крокі, каб перадаць школу ў пэўныя рукі беларуса, а такім якраз з'яўляецца вучыцель гэтай школы гр. А. Барткевіч. Прысутнасць Александровіча ў школе будзе мяшаць расцвету школы, якая з такімі труднасцямі стварылася, а таму пара было бы падумаць адсунуць гэтага 'пана' з беларускай школы*". А. Якубецкі, *Гісторыя разьвіцьця Дзьвінскай Беларускай школы*, "Голас беларуса" 1926, № 37(19), с. 4.

[1101] *Па-сяброўску*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1927, № 5(3), с. 61.

[1102] LVVA, 2125 f., 5 ap., 77 l., 46 lp.

[1103] LVVA, 2125 f., 5 ap., 387 l., 124 lp.

вучні звярнуліся да мяне з просьбай прыняць крокі каб у школе такія кары не ўжываліся і вучыц. была звольнена ці пераведзена ў другую школу. На маё запытанне, чаму ў школе ўжываюцца такія кары, вучыц. Маркоўская адказала, што без такіх кар яна не можа ўтрымаць парадак у школе і што нават бацькі яе прасілі быць пастражэй з вучнямі"[1104].

Маральныя якасці настаўнікаў былі рознымі. Назапашаны архіўны матэрыял дазваляе сцвярджаць, што сярод педагогаў беларускіх школ пераважалі асобы, маральная беззаганнасць якіх не выклікала сумневу. Пытаннямі дысцыпліны настаўнікаў займалася на сваіх пасяджэннях Рада БША. 9 ліпеня 1928 г. рада аддзела даручыла інспектару беларускіх школ звярнуць увагу на "маральны бок жыцця беларускага вучыцельства". Прычынай з'яўлення дакумента быў выпадак, які тычыўся настаўніцы Марыі Каспяровіч. На думку У. Пігулеўскага, жанчына "сваім асабістым жыццём не адпавядае званню вучыцелькі беларускіх школ". На яго прапанову Рада Беларускага школьнага аддзела пастанавіла параіць настаўніцы пашукаць працы па-за беларускімі школамі. Толькі К. Езавітаў лічыў, што настаўніцы варта даць шанец, прапануючы "ўпарадкаваць сваё жыццё альбо пакінуць службу ў беларускай школе"[1105].

Можна меркаваць, што некаторым настаўнікам было ўласцівае нядбайнае стаўленне да працы і злоўжыванне алкаголем. 25 сакавіка 1929 г. інспектар беларускіх школ Я. Кастылюк звярнуў увагу на неадпаведныя паводзіны настаўнікаў Марыі Захаравай, Канстанціна Дубавіка, Мікалая Дзямідава, Еўфрасінні Маркоўскай і Феліцыяна Астроўскага. Траім першым ён ставіў у віну прагулы і спазненні на працу, а апошняму – п'янства. Найбольш клопату прыносіў Ф. Астроўскі. З назіранняў іншых настаўнікаў вынікала, што ён "*прапускае шмат лекцыяў, п'янствуе ў вурочныя часы (...) з'явіўся ў (...) школе 14/III п'яны і пачаў разганяць вучняў дахаты*"[1106]. Тым часам інспектар Я. Кастылюк канстатаваў, што гэты настаўнік у п'яным стане з'явіўся ў Вайцюлеўскую школу, дзе "*пачаў разганяць вучняў дадому (...) но яго адтуль справадзілі назад, палажыўшы зусім п'янага ў санкі*"[1107]. 10 чэрвеня 1929 г. Рада БША абмеркавала паводзіны настаўніцы Лудзенскай беларускай школы Раісы Жданко. Не захаваліся, аднак, падрабязнасці гэтай справы[1108]. 3 траўня 1930 г. Рада Беларускага школьнага аддзела разгледзела справу настаўнікаў Пятра Жукоўскага, Феліцыяна Астроўскага і Даната Казлоўскага – яны, нягледзячы на ранейшыя папярэджанні, працягвалі п'янстваваць. Рада БША

[1104] LVVA, 2125 f., 5 ap., 387 l., 64 lp.
[1105] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 75 lp.
[1106] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 98 lp.
[1107] LVVA, 2125 f., 5 ap., 127 l., 140 lp.
[1108] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 2 lp.

дала апошняе папярэджанне ўсім тром: калі не зменяць паводзін, страцяць права працаваць у беларускіх школах[1109]. Такая ж пагроза датычыла настаўніка 2-й Рыжскай беларускай школы М. Дзямідава. За яго, аднак, заступілася таварыства "Беларуская хата", кіраўніцтва якой у 1931 г. абскардзіла патрабаванне некаторых сяброў Рады БША адхіліць М. Дзямідава ад педагагічнай дзейнасці[1110].

Вышэйзгаданыя інцыдэнты не маглі не хваляваць як беларускае школьнае кіраўніцтва, так і грамадскасць. 26 студзеня 1930 г. адбыўся з'езд сяброў ТБНЛ, які прыняў рэзалюцыю да інспектара беларускіх школ з прапановай "*Звярнуць увагу Беларускага аддзела на падгатоўку належнага кадру маладых свядомых школьных працаўнікоў*"[1111]. 23 верасня 1930 г. у Рызе прайшла беларуская настаўніцкая канферэнцыя, на якой прысутнічалі 20 дэлегатаў. Падчас яе У. Пігулеўскі звярнуў увагу на пагаршэнне дысцыпліны ў школах. Яго думку падзяляў П. Журкоўскі, які лічыў, што настаўнікі павінны дбаць пра тое, каб вучні іх паважалі[1112].

Беларускае школьнае кіраўніцтва і беларускі актыў намагаліся рэагаваць на праявы недасканаласці ў настаўніцкім асяроддзі. Дзеля павышэння кваліфікацыі педагогаў ад 1927 г. у беларускіх школах адбываліся метадычна-педагагічныя сходы. Многія праблемы ў педагагічнай працы абмяркоўваліся на старонках прэсы. Інспектар беларускіх школ Я. Кастылюк пісаў пра заганы ў пазашкольнай працы педагогаў. Ён лічыў, што нярэдка настаўнікі ставяцца да сваёй працы па-чыноўніцку ("*вялікая частка вучыцельства глядзіць на сваю службу так, як звычайны чыноўнік на сваю*"), не прысвячаючы часу пазашкольнай і грамадскай працы: "*Прыйшла вясна; ужо 18 траўня вучыцеля ў школе няма, застаецца толькі той, хто мае сям'ю, хто мае сваю гаспадарку пры школе, але і гэтага цікавіць больш свая гаспадарка, чым грамадскае жыццё. Ёсць вучыцелі і вучыцелькі, якія да гэтага часу чамусь саромеюцца зайсці ў хату селяніна і пагутарыць з ім аб сялянскім жыцці, аб грамадскіх справах. Вядома, пры такім адношанні да сваёй працы, няма ніякай сувязі паміж школай і вёскай, як яе няма паміж вучыцелем і той моладдзю, з якой ён працуе, якую ён выхоўвае. І вось пры такім адношанні да школы вучні школай мала зацікаўленыя, бацькі на вучыцеля глядзяць як на чыноўніка і іх старыя пагляды на школу застаюцца такія ж самыя, якімі былі 20 год назад, асабліва моцна пануюць гэтыя пагляды сярод беларускага жыхарства, мала свядомага, матэрыяльна і духова прыгнечанага*"[1113]. Выйсце з сітуацыі

[1109] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 14, 18 lpp.
[1110] LVVA, 2125 f., 5 ap., 24 l., 16 lp.
[1111] LVVA, f. 2924, apr. 1, l. 83, 24 lp.
[1112] LVVA, f. 2125, apr. 5, l. 92, 13 lp.
[1113] Я. Кастылюк, *Школа і яе недахопы*, "Пагоня" 1930, № 1, с. 10.

інспектар бачыў у тым, каб настаўнікі пачалі працаваць не толькі ў школе, але і па-за яе мурамі: "*Гэтыя пагляды зменяцца толькі тады, калі вучыцель бліжэй стане да вёскі, калі ён вальецца ў гэту грамадскую гушчу, стане на чале грамадскае працы, калі ён будзе на вёсцы працаваць не толькі ў школе, але і па-за школай гуртуючы навокал сябе грамадзянства, асабліва моладзь, наладжваючы бібліятэкі, чытальні, розныя культурна-прасветныя арганізацыі, курсы і вячэрнія заняткі для дарослых па розных галінах вясковае гаспадаркі*"[1114].

На недахопы пачатковых школ звяртаў увагу таксама ананімны аўтар, які на старонках часопіса "Школьная праца" вінаваціў настаўнікаў у фармальным падыходзе да абавязкаў. У артыкуле чытаем: "*Асабліва ў ненармальным становішчы знаходзіцца ў пачатковай школе навучэнне мовы. Вучань, яшчэ не ведаючы граматыкі сваёй роднай мовы, павінен ў 11–12 гадоў (...) вучыць яшчэ дзве-тры чужыя мовы. Як можа галава малога неакрэпшага дзіцяці трымаць граматыку чатырох моў? А каторыя ж вучыцелі, асабліва з маладых, часта зусім не лічацца з здольнасцямі сваіх вучняў, а задаюць толькі ўсё новы і новы матэрыял, не цікавясь тым, наколькі ўсвоілі стары матэрыял. Нават больш таго, прымушаюць вучняў завучваць на памятку вершы, апавяданні без усялякага разумення імі слоў і сэнсу. Такая пастаноўка ў нашых пачатковых школах уваскрошыць расейскую эпоху 'класіцызму'*"[1115].

Як ужо адзначалася ў раздзеле 2, дзеля вырашэння бягучых пытанняў працы педагогаў склікаліся настаўніцкія канферэнцыі. Іх ініцыятарамі выступалі ТБНЛ і БША. Кіраўніцтва апошняга лічыла, што яго "баявой" задачай ёсць арганізацыя канферэнцый, з'ездаў і нарад з мэтай глыбейшага ўсведамлення настаўніцтва. Найчасцей гэтыя мерапрыемствы адбываліся ў Рызе, Даўгаўпілсе і Лудзы. Адна з іх была скліканая з ініцыятывы ТБНЛ 8–9 чэрвеня 1929 г. у Рызе, у будынку 1-й школы. Удзельнікі праслухалі даклад прадстаўніка Уселатвійскага настаўніцкага хаўрусу і лекцыю кіраўніка Рыжскай школьнай управы Яна Абэрбера па тэме *Старая Рыга і яе гістарычныя помнікі*[1116]. 2–3 чэрвеня 1930 г. у сталіцы адбылася чарговая канферэнцыя, у якой узялі ўдзел: кіраўнік БША, інспектар беларускіх школ, прадстаўнікі Міністэрства асветы і дэпутаты Сойму. Мерапрыемства распачаў даклад У. Пігулеўскага *Ітогі і пэрспэктывы беларускай культурнай працы ў Латвіі* і даклад дэпутата парламента К. Дэкена *Новы школьны закон*[1117].

Незалежна ад уселатвійскіх канферэнцый беларускіх настаўнікаў, склікаліся нарады і канферэнцыі мясцовага характару. На іх абмяркоўваліся

[1114] Я. Кастылюк, *Школа і яе недахопы*, "Пагоня" 1930, № 1, с. 11.

[1115] Бацька, *Школа, Міністэрства Прасьветы і жыцьцё*, "Школьная праца" 1926, № 3–4, с. 2.

[1116] LVVA, 2125 f., 5 ap., 22 l., 20 lp.

[1117] LVVA, 2125 f., 5 ap., 24 l., 7 lp.

бягучыя пытанні школьнай працы. Гэтыя мерапрыемствы праводзіліся на Даўгаўпілшчыне і Лудзеншчыне. Так, 5 студзеня 1930 г. у Ляўдарах прайшла канферэнцыя беларускага настаўніцтва Лудзенскага павета[1118]. 30 лістапада 1930 г. у Лудзы была склікана яшчэ адна канферэнцыя беларускага настаўніцтва Лудзенскага павета (удзельнікі: П. Журкоўскі, С. Казека, Р. Жданко, П. Жукоўскі, М. Іваноў)[1119]. 20 жніўня 1931 г. у Даўгаўпілсе інспектар беларускіх школ склікаў сход беларускага настаўніцтва Даўгаўпілскага павета[1120]. 31 студзеня 1932 г. у Даўгаўпілсе адбылася канферэнцыя беларускага настаўніцтва Даўгаўпілшчыны, удзельнікі якой раіліся, як спыніць скарачэнне беларускіх школ[1121].

Вучні. У разгляданы час колькасць вучняў беларускіх пачатковых школ у Латвіі моцна вагалася. Школы наведвала ад 1,9 тыс. да 2,5 тыс. навучэнцаў. Яскрава сведчаць пра гэта звесткі, пададзеныя ў табліцы.

Табліца 39. Колькасць вучняў у беларускіх пачатковых школах 1925–1933 гг.

Навучальны год	Даўгаўпілскі павет	Лудзенскі павет	Даўгаўпілс	Лудза	Рыга	Разам
1925/26	956	890	110	100	263	2 574
1926/27	817	793	133	97	253	2 093
1927/28	766	703	145	94	277	1 985
1928/29	839	677	180	95	399	2 190
1929/30	921	854	198	108	428	2 509
1930/31	896	174	239	86	547	1 935
1931/32	976	115	231	89	634	2 045
1932/33	864	40	233	0	623	1 760
1933/34	1 058	42	130	0	633	1 863

Уласная апрацоўка на падставе: LVVA, 2125 f., 5 ap., 333 l., 58 lp.; LVVA, 2125 f., 5 ap., 33 l., 3 lp.

Колькасць вучняў у школах была рознай. Да ліку найбуйнейшых належалі 6-годкі. Напрыклад, у 1928/29 гг. Даўгаўпілскую школу наведвала 180 чал., 1-ю Рыжскую – 170, 2-ю Рыжскую – 156, Лудзенскую – 100, Ляўдарскую – 90. З цягам часу лічба вучняў у першай яшчэ павялічылася – да 208 у 1933/34 гг.[1122]

[1118] LCVA, f. 368, ap. 1, b. 33, l. 278.

[1119] LVVA, 2125 f., 5 apr., 92 l., 19 lp.

[1120] *Сход беларускіх вучыцялёў Дзьвінскага павету*, "Беларускае слова" 1931, № 1, с. 4.

[1121] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 114, л. 1.

[1122] LVVA, 2125 f., 5 ap., 33 l., 3 lp.

Тым часам колькасць вучняў у вясковых 4-класных школах у 1928/29 гг. вагалася ад 22 (Руднінская) да 81 (Пітэрская)[1123].

Этнаканфесійны склад вучняў не зазнаў істотных змен у параўнанні з першымі гадамі існавання беларускіх школ у Латвіі. Нягледзячы на тое, што паводле заканадаўства школы нацменаў маглі наведваць толькі асобы той нацыянальнасці, для якой яны ствараліся, на практыцы было інакш. У 1928/29 гг. сярод вучняў палякамі – 9, латышамі – 8, рускімі – 36 і літоўцамі – 6. З цягам часу сітуацыя мала змянілася. У 1929/30 гг. было вядома, што беларускія школы наведвала не менш 8 латышоў, 36 рускіх, 9 палякаў, 6 літоўцаў і 1 прадстаўнік іншай нацыянальнасці[1124].

Табліца 40. Нацыянальны склад вучняў беларускіх школ у 1933/34 гг.

Школы	Вучні	Беларусы	Латышы	Рускія	Немцы	Палякі	Літоўцы	Іншыя
Даўгаўпілскі павет	1 058	1 024	2	31	0	0	1	0
Лудзенскі павет	42	42	0	0	0	0	0	0
Рыга	633	584	4	28	1	6	8	2
Разам	1 733	1 650	6	59	1	6	9	2

Крыніца: LVVA, 2125 f., 5 ap., 31 l., 1–2 lpp.

Па-ранейшаму беларускія школы адлюстроўвалі рэлігійную мазаіку беларускамоўнай латгальскай вёскі. Пераважная большасць вучняў належала да трох канфесій: каталіцкай, праваслаўнай і стараверскай. Здараліся выпадкі, калі сярод вучняў былі лютэране ды іўдзеі. Напрыклад, у Краслаўскай школе вучыліся 36 каталікоў, 1 старавер і 1 іўдзей[1125].

Трапляліся вучні, якія не мелі латвійскага грамадзянства. Напрыклад, у сакавіку 1929 г. кіраўнік Даўгаўпілскай школы прасіў БША дазволіць вучню 4-га класа Мікалаю Булаўскаму вытрымаць іспыт напярэдадні праваслаўнага Вялікадня, бо ён як грамадзянін БССР адразу пасля святаў мусіць пакінуць Латвію[1126]. Аднак падобныя выпадкі былі рэдкія, амаль усе вучні з'яўляліся дзецьмі грамадзян Латвіі.

Па-ранейшаму большасць вучняў былі дзецьмі незаможных сялян. Выключэнне складалі навучэнцы рыжскіх школ, дзе вучыліся гараджане

[1123] LVVA, 2125 f., 5 ap., 259 l. 54–55 lpp.; *Сьпіс беларускіх школ і настаўніцтва ў Латвіі ў бягучым 1928–29 навучальным годзе*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1929, № 9(1).

[1124] LVVA, 2125 f., 5 ap., 27 l., 1 lp.

[1125] LVVA, 2125 f., 5 ap., 146 l., 1 lp.

[1126] LVVA, 2125 f., 5 ap., 127 l., 127 lp.

ў першым пакаленні. Сацыяльнае становішча вучняў заставалася адной з галоўных праблем у працы школ. Праз незаможнасць навучэнцы кепскай наведвалі заняткі. Беларускія асветныя ўстановы сцвярджалі, што ў сярэднім школу наведвала менш як 50% вучняў. Пацвярджаюць гэта шматлікія сведчанні беларускіх настаўнікаў. У ліпені 1927 г. кіраўніца Келаўскай школы Антаніна Салаўёва інфармавала, што з прычыны малой яўкі заняткі ў школе пачаліся толькі 10 кастрычніка 1927 г. пры 23 вучнях, а тым часам на паперы было іх каля 80[1127]. Настаўніца дадавала: "*Многія з дзяцей не маюць за што купіць сшытка ці алоўка, дапамогі ад інспектара не хапае і на першую палову навуч. года*"[1128]. У лістападзе 1927 г. кіраўнік Цуцуркаўскай школы Васіль Руднікаў інфармаваў БША, што навучальны год ён пачаў пры наяўнасці ў школе толькі пяці вучняў. Адной з прычын такога дрэннага наведвання ён лічыў факт, што напярэдадні ў вёсцы адбыўся вялікі пажар, які пазбавіў палову жыхароў даху над галавой[1129].

Сялянскія дзеці былі вымушаны спалучаць навучанне з дапамогай бацькам на гаспадарцы. Таму, невыпадкова, найменш вучняў у школах бывала ў час веснавых і восеньскіх сельскагаспадарчых прац. Беднасць нярэдка ставіла перад бацькамі выбар, куды пасылаць дзетак: ці ў школу, ці ў заробкі. Кіраўніца Келаўскай школы А. Салаўёва ўлетку 1927 г. пісала: "*Мною быў зроблены абыход хат на вёсках майго раёна. З гутарак з бацькамі высветлілася, што адны дзеці пайшлі ў пастухі, некаторыя (большасць) уехалі ў Латвію на заробкі, некаторыя к вясне не маюць ні абутку, ні нават, хлеба ўдастань*"[1130]. Трапна сітуацыю тлумачыў інспектар Я. Кастылюк: "*Лагтальскае жыхарства, асабліва беларускае, вельмі беднае, мае ад 2 да 6 гектараў зямлі, з якой не пракормішся; прыходзіцца й самаму ісці на працу, дый дзетак пасылаць у пастухі ў далёкую Земгалію, Ліфляндыю ці нават да багатага засцянкоўца ў Латгаліі. Згодна з дамовай, дзеці павінны пасвіць аж пакуль не выпадае снег і пакуль сам гаспадар не выправіць пастушка да бацькавае хаты, парахаваўшыся з ім грашыма ці бульбай, вопраткай і абуткам. Вяртаецца дзіцянё дахаты, патрэбна ісці ў школу, а ў яго няма яшчэ ботаў ці кажуха, патрэбна на зароблены грошы купіць гатовае або зрабіць і гэта адымае таксама шмат часу, а тым часам падыходзяць Каляды. Добра, калі за тыдзень да Каляд пастушок трапіў пайсці ў школу, але і там не прыходзіцца яму добра, няма калі дагнаць прапушчанага часу. Ледзве-ледзве снег з палёў пачынае таяць, як зноў вучню прыходзіцца думаць, дзе ён будзе працаваць летам. Тымчасам у вёску наязджаюць гаспадары і пакрыху*

[1127] LVVA, 2125 f., 5 ap., 141 l., 13 lp.
[1128] LVVA, 2125 f., 5 ap., 141 l., 6 lp.
[1129] LVVA, 2125 f., 5 ap., 121 l., 37 lp.
[1130] LVVA, 2125 f., 5 ap., 141 l., 6 lp.

разбіраюць вучняў яшчэ да Вялікадня ў пастухі. З сакавіка школа зноў напалову пустуе, а пасля Вялікадня ходзяць толькі маленькія і то дзеці заможных бацькоў"[1131].

Многія вучні не маглі наведваць школу ў халодную пару года, бо не мелі цёплага абутку і вопраткі. Захаваліся шматлікія заявы кіраўнікоў школ да БША з просьбамі выдаткаваць больш сродкаў на закуп абутку для вучняў[1132]. Настаўніца беларускага камплекта ў Мала-Індраўскай школе Юзэфа Васілеўская пісала (8 сакавіка 1928 г.): "*Вельмі прашу Беларускі аддзел адпусціць для Мала-Індраўскае школы (беларускага камплекта) яшчэ хоць невялічкую суму для абутак і вопраткі, бо тая сума, якая ўжо вытрачана, зусім малы працэнт задаволіла вучняў, а рэшта адмаўляецца хадзіць у школу ў такія маразы, бо выключна ўсе дрэнна апрануты*"[1133]. Кіраўнік Круманаўскай школы Станіслаў Красневіч 18 кастрычніка 1928 г. інфармаваў інспектара беларускіх школ пра тое, што большасць вучняў паходзіць з вёсак, даведзеных да галечы паводкай. Навучальны год школа пачала з 12 вучнямі, у той час, як зарэгістраваных было 40. Кіраўнік прасіў забяспечыць вучняў адзеннем, абуткам і гарачымі сняданкамі. У адваротным выпадку, сцвярджаў ён,"вучні не змогуць акуратна наведваць школу"[1134]. У падобнай справе да БША звярнуўся кіраўнік Шушкаўскай школы Сцяпан Маціеўскі. У 1928 г. яго школа атрымала 70 латаў дапамогі: 50 – з таварыства "Рунь" і 20 – з БША. 5 сакавіка 1929 г. ён пісаў: "*Палова, прыблізна, гэтых грошай ужо страчана на абуткі вучням, а другая палова, прадназначана на ежу, засталася. У сярэдзіне студзеня месяца гг. атрымана дапамога ад павятовага інспектара на ежу, такім чынам, вострасць нужды ў сэнсе ежы значна прытуплена, затое надта востра адчуваецца патрэба ў абутках вучням, а таму вельмі прашу Упраўленне дазволіць тую палову грошай, якая была прадназначана на ежу, страціць на абуткі*"[1135]. Школьная рада Цуцуркаўскай школы 3 кастрычніка 1929 г. прасіла БША выдаткаваць дапамогу найбяднейшым вучням "*на здабыццё прадметаў першай неабходнасці, як то: абутку, адзежы і іншага*". Пры гэтым яна адзначала: "*Даводзіцца да ведама Вашага, што радзіцелі вучняў Цуцурскай школы, амаль што, усе па свайму сацыяльнаму становішчу з'яўляюцца незаможнымі, якія нуждаюцца ўва ўсім. Гаспадаркі невялікія, а пасля прашлагодніх неўраджаяў запусцілі зусім, і здабыць нічога нельга, а ў звязку з гэтым і грошай неадкуль атрымаць бацькам на пакупку сваім дзецям адзежы і абутку. Школьная рада мае ўпэўненасць, што Беларускі*

[1131] Я. Кастылюк, *Школа і яе недахопы*, "Пагоня" 1930, № 1, с. 8.

[1132] LVVA, 2125 f., 5 ap., 399 l., 114 lp.

[1133] LVVA, 2125 f., 5 ap., 399 l., 49 lp.

[1134] LVVA, 2125 f., 5 ap., 149 l., 1 lp.

[1135] LVVA, 2125 f., 5 ap., 399 l., 117 lp.

аддзел дапаможыць бяднейшым вучням Цуцурскай школы ў гэтым наступаючым навучальным годзе"[1136].

У выніку кепскага наведвання некаторыя школы на працягу свайго існавання не мелі ніводнага выпуску, бо вучні, прахадзіўшы 2–3 гады, кідалі школу. З гэтай прычыны Лудзенскую школу за 10 гадоў існавання (1922–1932 гг.) скончыла толькі 20 чал.[1137] Не пярэчылі і бацькі вучняў, сярод якіх была пашыраная думка, што "*калі хлопчык ці дзяўчынка нахадзілі дзве-тры зімы ў школу, навучыўся чытаць і пісаць, дык і досыць, хай ходзіць той, хто хоча за пана выйсці*"[1138]. Праз невялікую колькасць вучняў некаторым школам, напрыклад, Вайцюлеўскай, пагражала закрыццё[1139]. Занятыя працай на гаспадарцы, вучні запускалі навучанне, што праяўлялася ў кепскіх выніках і "заседжванні" па некалькі гадоў у адным класе[1140]. Настаўнік Лудзенскай школы М. Талерка пісаў, што толькі нешматлікія давучваліся да іспытаў, бо праз беднасць большасць кідала школу[1141].

Беларускае настаўніцтва не ігнаравала праблему з наведваннем. Вось як характарызаваў сацыяльную апеку над вучнямі У. Пігулеўскі ў дакладзе, зробленым у 1929 г.: "*Вучні гэтых школ задавальняюцца безграшова пісьменнымі прыладамі, падручнікамі, а найбольш бедныя яшчэ вопраткаю ці абуткам. Апрача таго, ува ўсіх школах вучням выдаецца безграшова снеданне (гарбата з цукрам і хлебам ці абаранкамі). На ўсё гэта патрэбныя сродкі асігнуе школам Латвійскі Сойм у бюджэтным парадку*"[1142]. На пасяджэнні Рады Беларускага школьнага аддзела, прысвечаным становішчу школьнай справы ў 1928/29 гг. Я. Кастылюк звяртаў увагу на паляпшэнне наведвальнасці. Інспектар лічыў гэта вынікам таго, што ў некаторых школах вучням пачалі даваць гарачую ежу[1143].

[1136] LVVA, 2125 f., 5 ap., 399 l., 79 lp.

[1137] С. Казэка, *Лудзенская беларуская асноўная 6-ціклясовая школа за 10 год працы – з 1922 па 1932 год*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 2(12), с. 164.

[1138] Я. Кастылюк, *Школа і яе недахопы*, "Пагоня" 1930, № 1, с. 9.

[1139] *Конфэрэнцыя беларускіх вучыцялёў у Дзьвінску*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 2(12), с. 169.

[1140] У 1929 г. кіраўнік Даўгаўпілскай беларускай школы А. Барткевіч прасіў БША дазволіць перавесці вучня дашкольнага класа Мікалая Альшэўскага ў 2-гі клас абгрунтоўваючы гэта наступным чынам: "*хлапец дарослы 11 гадоў, улетку шмат гатаваўся вучыцца. Наогул хлапец развіты і па сваіх гадах, ведзе і развітку падыходзе да другое класы. Бацькі ў яго няма, а маці падала просьбу, каб яго дапусцілі ў другую класу, бо яна жадае каб ён хутчэй скончыў і дапамагаў-бы ёй жыць, бо акрамя яго ёсць яшчэ 4 малых*". LVVA, 2125 f., 5 ap., 127 l., 147 lp.

[1141] С. Казека, *Гістарычная спраўка аб Лудзенскай беларускай 6-ціклясовай пачатковай школе*, "Голас беларуса" 1926, № 19 ад 1 верасня, с. 5.

[1142] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 1 lp.

[1143] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 95 lp.

Кіраўніцтва беларускай школьнай аўтаноміі і беларускі актыў неаднаразова звярталіся да ўлад краіны і органаў самакіравання з просьбай пра дадатковыя сродкі на дапамогу найбяднейшым вучням. У снежні 1927 г. Даўгаўпілскі аддзел ТБЛН (старшыня С. Сахараў, сакратар П. Масальскі) прасіў БША зрабіць захады перад асветнымі ўладамі, каб атрымаць 3 840 латаў на арганізацыю летніка для бедных вучняў, аргументуючы просьбу тым, што "*У Месту Дзвінску, як у пачатковай беларускай школе, так і ў беларускай гімназіі, а таксама і ў беларускіх школах павета, маецца шмат бедных дзетак і круглых сірот, якія ў працягу вучэбнага года знаходзяцца ў вельмі цяжкіх варунках жыцця. К канцу вучэбнага года гэтыя дзеці без належнай ежы і пры сваіх занятках, з'яўляюцца стомленымі і кволымі, на летні ж адпачынак яны разлічваць не могуць, бо бацькі, ці заступаючыя іх месца, аддаюць іх на цяжкія летнія працы*"[1144]. У верасні 1928 г. інспектарат пачатковых школ асігнаваў 46 500 латаў для найбяднейшых вучняў школ Ілукшчыны, Даўгаўпілшчыны і Лудзеншчыны[1145]. Рэдакцыя газеты "Голас беларуса" лічыла, што беларуская грамадскасць павінна актыўней шукаць шляхоў вырашэння матэрыяльных цяжкасцей вучняў і бацькоў. У адным з артыкулаў чытаем: "*Няможна дапусціць, каб у культурнай дзяржаве былі дзеці, якія не могуць хадзіць у школу толькі таму, што іхнія бацькі не могуць ім пашыць ботаў і кажушка (...) А на дапамогу мы маемо права не толькі па агульных латвійскіх законах, але яшчэ і таму, што жывём мы ў самай разбуранай вайсковымі падзеямі частцы Латвіі і самым беззямельным і малазямельным яе кутку. Дык, не чакаючы дабрадзеяў, якія зацікавіліся бы Вамі і ўзяліся дапамагаць Вам, бярыцеся самі за высвятленне сваіх патрэбаў, стукайце ва ўсе належныя дзверы, ва ўсе ўстановы, каб на Вас звярнулі нарэшце ўвагу і дапамаглі*"[1146].

З мэтай дапамогі найбяднейшым вучням было вырашана стварыць стыпендыйны фонд на сродкі са складак настаўнікаў і ахвяраванняў грамадскасці. Прыбытковай крыніцай фінансавання былі латарэі. У 1927/28 гг. за кошт латарэяў бюджэт Лудзенскай школы папоўніўся на 2 530 латаў, а ахвя-

---

[1144] Далей у дакуменце чытаем: "*У звязку з гэтым Дзвінскі Аддзел Таварыства Беларускіх Вучыцялёў просіць Вас, гр. Кіраўнік, зрабіць ужо зараз неабходныя захады перад належнымі ўстановамі аб водпуску 3,840 латаў па дададзенай да гэтага смеце на арганізаванне для бедных беларускіх дзяцей, якія навучаюцца ў беларускіх школах, летняй калоніі каля горада Дзвінска, дзе маюцца падыходзячыя мясцовасці ў сасновым бару (Строна і Пагулянка) і добрыя варункі для ўтрымання дзяцей. Іншыя нацыянальныя меншасці ўжо маюць такія калоніі, напрыклад, жыды і расейцы, тым больш павінны мець гэткія калоніі беларусы, сярод якіх найвялікшы працэнт бедных. Аб выніках гэтае просьбы просіма нас паведаміць*". LVVA, 2924 f., 1 ap., 80 l., 11 lp.

[1145] LVVA, 2125 f., 5 ap., 84 l., 27 lp.

[1146] *Аб 6-ці клясовай беларускай пачатк. школе*, "Голас беларуса" 1926, № 21 ад 6 кастрычніка, с. 3.

раванні настаўнікаў склалі 1 054 латы[1147]. Беларускі актыў шукаў падтрымкі таксама па-за межамі Латвіі. У лістах менскім беларусам К. Езавітаў прасіў атрымаць матэрыяльную дапамогу незаможным вучням па лініі Беларускага чырвонага крыжа[1148]. Тыя захады не прынеслі, аднак, пажаданых вынікаў.

У рыжскіх беларускіх школах, у адрозненне ад вясковых, вучыліся ў асноўным дзеці рабочых. Але праблемы тут былі падобныя: бацькі навучэнцаў належалі да найменш заможных жыхароў сталіцы. Вучні-гараджане, як і вясковыя, былі вымушаны спалучаць навучанне з падпрацоўкамі, каб дапамагчы бацькам. Тамтэйшае настаўніцтва заклікала грамадства збіраць сродкі, каб дапамагчы бацькам і тым самым дазволіць іх дзеткам атрымаць хоць пачатковую асвету. На старонках прэсы настаўнікам дзвюх беларускіх школ у Рызе прапаноўвалі ладзіць дабрачынныя фэсты і латарэі[1149]. Кіраўніцтва 2-й Рыжскай школы шукала магчымасці атрымаць матэрыяльную дапамогу для найбяднейшых навучэнцаў. 20 ліпеня 1929 г. К. Езавітаў пісаў у БША: "*Матэрыяльны стан бацькоў усіх вучняў надзвычайна цяжкі. Вучняў заможных у школе зусім няма, як няма і такіх, бацькі каторых займалі б сталую так званую інтэлігентную пасаду або мелі вольную прафесію (выключэнне з гэтага стану складаюць толькі 3 вучняў). Рэшта вучняў з'яўляецца дзецьмі мнагадзетных рабочых, што працуюць па вольным найме, на выпадковых чорнарабочых работах, найбольш знаходзячы сябе працу толькі ў вясенне-летні сезон, а зіму перабіваючыся без працы. 15% вучняў з'яўляюцца сіротамі, маючы або толькі матку, або толькі бацьку. Стан гэтых вучняў надзвычайна цяжкі. 75% агульнае лічбы вучняў улетку працуе, каб дапамагчы бацькам. Не працуюць толькі тыя, малыя вучні, якіх яшчэ не хочуць гаспадары*

[1147] С. Казека, *Лудзенская беларуская асноўная 6-ціклясовая школа за 10 год працы – з 1922 па 1932 год*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 3(13), с. 183–185.

[1148] У лісце А. Чарвякову (8 жніўня 1928 г.) чытаем: "*Трэба было б зрабіць Чырвонаму Крыжу які-колечы дзень дапамогі бедным вучням нашых школ і сабраць грошы, якія можна было б праз Т-ва беларускіх вучыцялёў, дзе я пакуль што старшынём, накіраваць нашым школам. А гэта дужа важна, бо латвійскія рэакцыянеры пабудавалі на мяжы з Сав. Беларуссю цэлы шэраг вялізных школ з інтэрнатамі, у якіх набіраюць дзяцей беларусаў, кормяць іх і вучаць на латышскай мове, каб аблатышыць. Беларускія школы ў халупках, інтэрнатаў няма, бедны, дык у латышскія школы хаця-нехаця змушаны пасылаць сваіх дзяцей. Дамагаліся мы, каб у гэтых школах выкладалася бы беларуская мова хаця бы як прадмет, але і гэтага не дабіліся, бо Пігулеўскі баіцца паставіць пытанне рашуча і востра, дрыжучы аб сваю пасаду. Цяперака такіх школ ужо дзясятак, пад іх адведзены палацы былых маёнткаў і будуюцца новыя вялізарныя будынкі. Ніводнага вучыцеля-беларуса ў такіх школах няма. Некалькі беларускіх школ закрыта, а на іх месца паадчынены латышскія. Пратэставаць можа толькі Езавітаў, але цяперака мне рот зачынены, бо 'Голас' маўчыць. Латышскія шавіністы цішком праводзяць тое, што зрабілі на Заходняй Беларусі палякі*". LVVA, 3235 f., 6 ap., 196 l., 18 lp.

[1149] *Неадкладныя патрэбы беларускае школы у Рызе*, "Голас беларуса" 1926, № 6 ад 20 траўня, с. 1.

браць у пастухі. Некаторыя вучні старшых класаў працуюць нават і ўзімку, зранку ходзячы ў школу, а ўвечары працуючы ў кіно і іншых прадпрыемствах (падносяць пакункі, клеяць афішы, раздаюць лятучкі, правяраюць уваходныя білеты, стаяць на працы заводскай у вячэрнюю змену)"[1150]. У сувязі з гэтым педрада школы вырашыла адлічваць па 5% штомесячнага заробку кожнага настаўніка на патрэбы найбяднейшых навучэнцаў. Кастусь Езавітаў адзначаў, што спробы зарабіць грошы шляхам арганізацыі вечарын і латарэй не прынеслі істотных вынікаў, паколькі большасць бацькоў з прычыны беднасці не бярэ ў іх удзелу[1151].

Такім чынам можна зрабіць выснову, што матэрыяльнае становішча вучняў заставалася гаротным на працягу ўсяго перыяду існавання беларускіх школ у Латвіі.

Культурнае жыццё. Акрамя педагагічнай функцыі, школы працягвалі быць істотным элементам патрыятычнага выхавання моладзі, якое адбывалася праз яе ўдзел у нацыянальна-культурных мерапрыемствах. Беларускі актыў увесь час матываваў педагогаў быць рухавіком нацыянальна-культурнай дзейнасці. Важнасць такой актыўнасці настаўнікаў асабліва падкрэсліваў К. Езавітаў. У кастрычніку 1925 г. на старонках рэдагаванага ім "Голасу беларуса" з'явіўся яго заклік да педагогаў ствараць у сваіх мясцовасцях беларускія хоры і спяваць патрыятычныя песні такія, як *Не пагаснуць зоркі ў небе*, *Мы выйдзем шчыльнымі радамі*, *А ў бары-бары – тры дарожанькі*, *Рабіна-рабіначка* і інш.[1152] На пасяджэнні Рады БША 1 кастрычніка 1927 г. К. Езавітаў прапанаваў абавязаць кожнага настаўніка браць удзел у культурна-асветных таварыствах. Дзеяч бачыў патрэбу пашыраць штат Беларускага

[1150] LVVA, 2125 f., 5 ap., 195 l., 101 lp.

[1151] У лісце К. Езавітава чытаем: "*Дзеля гэтага цяжкога матэрыяльнага стану вучняў, Педагогічная Рада школы адлічае ад пенсіі ўсіх настаўнікаў штомесячна па 5% з пенсіі, каб закупіць вучням падарункі, сшыткі, алоўкі і інш. школьныя дапамогі, але гэтых адлічэнняў не хапае. Большага ж настаўнікі ўжо даць не маюць магчывасці. Спробы адшукаць сродкі шляхам арганізацыі вечарын, латарэй і іншых прадпрыемстваў, якімі збіраюць сродкі іншыя школы, – не даюць на Чырвонай Дзвіне пажаданых вынікаў, бо бацькі вучняў на платныя вечарыны хадзіць нямаль не могуць, а калі і прыходзяць, дык на білеты ў 25–30 сантымаў, якія зразумела не могуць забяспечыць добрага збору; іншая ж публіка на Чырвонай Дзвіне адведвае галоўным чынам кіно, ды і таксама не мае сродкаў на дабрачыннасць, бо складаецца з незаможных рабочых і дробных чыноўнікаў. Таму большасць вечарын і спектакляў, якія робіць школа, маюць характар не вечарын для збору грошы з адведвальнікаў, а вечарын пазашкольнага выхавання, вечарын яднання паміж бацькамі і школай. Ад гэтых вечарын школа набывае маральны капітал, але не можа сабраць сродкаў на належную дапамогу вучням*". LVVA, 2125 f., 5 ap., 195 l., 101 lp.

[1152] *Настаўнікі і спевакі закладайце на вёсках, гарадох і мястэчках беларускія хоры!* "Голас беларуса" 1925, № 16 ад 30 кастрычніка, с. 3.

школьнага аддзела за кошт інспектара альбо намесніка кіраўніка аддзела, які "мог бы аб'яднаць школы і т-вы"[1153].

Важнай нагодай да актывізацыі культурнай працы школы з'яўляліся Дні беларускай культуры, якія ладзіліся з ініцыятывы нацыянальнага актыву. Упершыню такое мерапрыемства адбылося ўвесну 1929 г. З мэтай падрыхтоўкі ў Рызе і Даўгаўпілсе былі створаны адмысловыя камітэты. Настаўнікі 2-й Рыжскай беларускай школы прынялі рашэнне адлічваць 2% месячнага заробку на патрэбы мерапрыемства[1154]. У выніку на арганізацыю дзён беларускай культуры настаўнікі ўнеслі 110 латаў[1155]. У межах падрыхтоўкі да Дзён беларускай культуры 27 красавіка 1929 г. Рада беларускіх арганізацый Даўгаўпілшчыны звярнулася да інспектара беларускіх школ з прапановай распрацаваць план культурных мерапрыемстваў (лекцый і спектакляў) у Даўгаўпілскім, Лудзенскім і Ілукштанскім паветах[1156].

Да актыўнай грамадскай працы на нацыянальнай ніве настаўніцтва заклікалі беларускія культурна-асветныя і прафесійныя таварыства, а ў першую чаргу – Таварыства беларускіх настаўнікаў у Латвіі. 26 студзеня 1930 г. адбыўся з'езд ТБНЛ, удзельнікі якога ўхвалілі рэзалюцыю да інспектара беларускіх школ з наступнымі прапановамі: "*1) Прасіць беларускія арганізацыі ў мэтах паднясення культурнага ўзроўню й нацыянальнай свядомасці беларускага жыхарства, перанясці працу на вёскі; 2) Наладзіць пазашкольную асвету адчыненнем дадатковых школ, вячэрніх курсаў, чытальнь-бібліятэк, лекцый і г.д. 3) Наладзіць вандроўны беларускі тэатр і хор; 4) Прасіць беларускі аддзел адчыніць у гэтым годзе кароткатэрміновыя курсы для вучыцялёў і беларускай свядомай моладзі па беларусазнаўстве й грамадскай працы; (...) 6) Наладзіць культурна-прасветную працу ў Рыжыцкім, Ілукштанскім паветах*"[1157].

Беларускія школы па-ранейшаму з'яўляліся месцамі, дзе граліся спектаклі, ладзіліся вечарыны і публічныя лекцыі, адзначаліся нацыянальныя святы. Варта прыгадаць найбольш вядомыя падзеі, якія адбываліся ў школьных мурах. Добры прыклад у нацыянальна-культурнай працы давалі настаўнікі і вучні сталічных беларускіх школ. У студзені 1927 г. пры 2-й Рыжскай беларускай пачатковай школе быў створаны вучнёўскі гурток Чырвонага Крыжа, у які запісаліся 45 чал. У склад яго кіраўніцтва ўвайшлі Алесь Скрыпка (старшыня), Антаніна Гарбачонак (намесніца старшыні), Сцяпан Гарбачонак (сакратар), Агей Парфееў (скарбнік), Франц Белюц (загадчык бібліятэкі), Пятро Дундар (кіраўнік драматычнай секцыі), Мікола Дамброўскі і Сафія

[1153] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 46 lp.
[1154] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 17, л. 9.
[1155] LVVA, 2125 f., 5 ap., 195 l., 97 lp.
[1156] LVVA, 2125 f., 1 ap., 83 l., 13 lp.
[1157] LVVA, 2924 f., 1 ap., 83 l., 24 lp.

Стэфановіч (сябры ўправы). Гурток дапамагаў настаўнікам у захаванні санітарнага стану школы, але таксама праводзіў культурна-асветную працу. Гурток выпісваў некаторыя выданні, у тым ліку часопіс "Заранка" (Вільня). Удзельнікі рыхтавалі вучнёўскія выставы і пастаноўкі п'ес. У прыватнасці, захаваліся звесткі пра спектакль *Модны шляхцюк*[1158]. У абедзвюх рыжскіх школах былі створаныя хоры. У 1-й беларускай школе ім кіраваў настаўнік Я. Каяла, а ў 2-й – настаўнік Я. Кудраўцоў[1159].

Акрамя тэатральнай працы ў рыжскіх школах ладзіліся публічныя лекцыі і ўрачыстасці з нагоды нацыянальных свят. Напрыклад, 29 лютага 1929 г. школьная рада 1-й Рыжскай беларускай школы прыняла рашэнне зладзіць лекцыю кіраўніка БША[1160]. 1 чэрвеня 1930 г. у гэтай жа школе адбылася вечарына, прысвечаная 30-й гадавіне смерці Францішка Багушэвіча[1161]. У 1931 г. беларускія рыжскія школы пачалі ладзіць лекцыі-канцэрты, да ўдзелу ў якіх запрашаліся як мясцовыя лектары, так і госці. 21 і 22 снежня 1931 г. у 1-й школе і ў Рыжскай прыватнай беларускай гімназіі адбылася лекцыя К. Езавітава *Значэньне кнігі і школы і чалавечым жыцьці і ў беларускім адраджэньні*. Пасля лекцыі адбыўся выступ хору пад кіраўніцтвам М. Грыўскага. 14 красавіка 1932 г. у будынку школы для дарослых М. Дзямідаў прачытаў лекцыю *Пазашкольнае выхаваньне*, а 24 красавіка ў Даўгаўпілсе – лекцыю *Пятро Антонавіч Крачэўскі*[1162]. У рыжскіх школах адбываліся таксама вучнёўскія выставы, на якіх дэманстраваліся вырабы і малюнкі, сабраныя падчас экскурсій па вёсках і заняткаў па краязнаўстве[1163]. У кастрычніку 1929 г. Рыжскі гарадскі музей звярнуўся ў БША з просьбай даслаць вырабы вучняў беларускіх школ[1164]. Тым часам у Даўгаўпілскай беларускай пачатковай школе ў першай чвэрці 1928/29 гг. было прачытана шэсць лекцый, у тым ліку *Цішка Гартны* (Я. Зэйгліш) і *Беларуская акадэмія навук* (А. Барткевіч)[1165].

28 лістапада 1931 г. ва ўсіх беларускіх школах адбылося святкаванне 10-годдзя існавання беларускай школьнай справы ў Латвіі[1166]. Беларускі школьны аддзел наступнымі словамі павіншаваў беларускае настаўніцтва і грамадскасць:

[1158] *Гурток Чырвонага Крыжа Моладзі пры 2-й Рыскай Беларускай Асноўнай школе*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1929, № 9(1), с. 15.

[1159] *Хроніка беларускага жыцьця у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 5(22), с. 336.

[1160] LVVA, 2125 f., 5 ap., 127 l., 120 lp.

[1161] The *Hoover Institution,* Yezovitov papers.

[1162] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 93, л. 15; *Хроніка беларускага жыцьця ў Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, 1(11), с. 160; *Хроніка беларускага жыцьця у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 2(12), с. 176.

[1163] *Хроніка беларускага жыцьця у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 2(12), с. 176.

[1164] LVVA, 2125 f., 5 ap., 84 l., 63 lp.

[1165] LVVA, 2125 f., 5 ap., 127 l., 118 lp.

[1166] *Карэспандэнцыі*, "Думка беларуса" 1931, № 3, с. 3.

"*У гэтым годзе споўнілася 10 год беларускай школьнай і прасветнай працы ў Латвіі. Беларуская меншасць, дзякуючы дэмакратычнасці латвійскага прасветнага закона, атрымала шырокія магчымасці для развіцця сваёй нацыянальнай прасветы і за гэтыя 10 год беларускія школы выхавалі многія сотні моладзі, якая з гонарам выконвае свае абавязкі і перад Латвійскай дзяржавай, і перад беларускім народам. Праз гэтую ж моладзь святло беларускай культуры перанесена і ў тыя колы беларускай меншасці, якія ў выніку дзейнічання гістарычных фактараў страцілі сваю нацыянальную свядомасць. Вялізарная заслуга ў правядзенні прасветнай і школьнай працы сярод беларускай меншасці ў Латвіі належыць беларускаму вучыцельству. Апрача агульнага цяжару педагагічнай працы беларускаму вучыцельству яшчэ прыходзілася выносіць на сваіх плячох упартае змаганне з тымі абставінамі, якія часта былі не спрыяючымі спакойнаму школьнаму жыццю. Дастойна з гонарам беларускае вучыцельства праводзіла гэтыя 10 год сваю нязмерна цяжкую працу, прыносячы ў ахвяру ёй не толькі свае асабістыя інтарэсы, але часта нават сваё здароўе і жыццё. Беларускае Упраўленьне вітае ўсе беларускія школы, іх вучыцялёў, вучняў і бацькоў з 10-годздзем беларускай школьнай працы ў Латвіі і жадае вялікіх поспехаў у іх далейшай працы на карысць Латвійскай Дзяржавы і беларускай меншасці ў Латвіі*"[1167].

У межах юбілею меркавалася ладзіць канцэрты, спектаклі, спартовыя мерапрыемствы, лекцыі (напрыклад: *Адраджэнчы рух паняволеных народаў*) і дыскусіі з удзелам вучняў старэйшых класаў і іх бацькоў, паказы вандроўнага кіно, экскурсіі, а кожная школа мусіла падрыхтаваць альбом пра сваю гісторыю[1168].

15 чэрвеня 1932 г. удзельнікі беларускай настаўніцкай канферэнцыі на прапанову М. Дзямідава вырашылі 8 ліпеня адсвяткаваць 50-годдзе нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа і з гэтай мэтай звярнуцца на Латвійскае радыё па дазвол прачытаць лекцыю пра беларускага песняра і нацыянальнае адраджэнне беларускага народа[1169]. Мерапрыемства прысвечанае Я. Коласу адбылося ў кастрычніку 1932 г. у Рызе. На сходзе беларускага актыву М. Дзямідаў і К. Езавітаў прачыталі лекцыі пра песняра. Пасля гэтага адбыўся паказ п'есы *Пінская шляхта* ў выкананні вучняў беларускай дадатковай пачатковай школы для дарослых[1170]. 28 студзеня 1933 г. Рыжская (вячэрняя) беларускай

[1167] LVVA, 6845 f., 2 ap., 19 l., 105 lp.

[1168] *Рыхтуйцеся да сьветкаваньня дзесяцігодзьдзя беларускага руху у Латвіі*, "Шлях праўды" 1930, 24 X, с. 4.

[1169] Стары вучыцель, *Конфэрэнцыя беларускіх вучыцялёў у Дзьвінску*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 2(12), с. 170.

[1170] *Акт-вечер Белорусскаго просветительнаго общества*, "Сегодня вечером" 1932, № 303 от 1 ноября, с. 5.

школа для дарослых зладзіла ў клубе “Вулей” вечарыну, прысвечаную 50-й гадавіне смерці Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, падчас якой М. Дзямідаў прачытаў лекцыю *Беларускі рух у 50-я ўгодкі смерці Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча*. Імпрэза завяршылася канцэртам беларускіх спеваў у выкананні Анэлі Латонас-Дзямідавай[1171]. 11 сакавіка 1933 г. вучні тае ж школы паставілі п’есу У. Галубка *Апошняе спатканне* (рэжысёр М. Дзямідаў, а дэкарацыі падрыхтаваў П. Мірановіч)[1172]. У красавіку 1933 г. ва ўсіх беларускіх школах адбыліся вечарыны і канцэрты з лекцыямі (К. Езавітаў, *80 год беларускага тэатра*), спектаклямі, дэкламацыяй вершаў, танцамі[1173].

Настаўнікі і вучні беларускіх школ удзельнічалі не толькі ў нацыянальных святах, але і ў агульнадзяржаўных грамадскіх і культурна-асветных мерапрыемствах. 16 сакавіка 1927 г. удзельнікі беларускіх дзяржаўных настаўніцкіх курсаў ушанавалі памяць прэзідэнта Я. Чакстэ[1174]. 9 снежня 1929 г. ва ўсіх беларускіх школах была адзначана 10-я гадавіна прыняцця Закона аб нацыянальных меншасцях. З гэтай нагоды настаўнікі правялі дадатковыя заняткі, патлумачыўшы вучням значэнне гэтай падзеі[1175]. У 1930 г. у сувязі з 80-годдзем прэзідэнта Чэхаславакіі Томаша Масарыка кіраўніцтва Беларускага школьнага аддзела раіла настаўнікам пазнаёміць вучняў з жыццём і дзейнасцю гэтага палітыка[1176]. У 1930 г. 50% вучняў беларускіх школ узяло ўдзел ва ўсеагульным перапісе насельніцтва Латвіі[1177].

Беларускія школы бралі ўдзел у Тыдні кнігі, які адбыўся з 22 лютага па 1 сакавіка 1931 г. Згодна з распараджэннем Міністэрства асветы, у школах чыталі рэфераты пра значэнне кніг, “ролю добрых кніг у развіцці вучняў і наагул чалавецтва”[1178]. Таксама беларускія школы ўдзельнічалі ў Тыднях народнай асветы, падчас якіх адбываліся публічныя лекцыі на тэмы культуры, мастацтва, выхавання, літаратуры, тэхнікі і гаспадаркі, а таксама ладзіліся спектаклі і выставы[1179]. Школы бралі ўдзел і ў антыалкагольных кампаніях[1180]. У 1930–1934 гг. беларускае настаўніцтва далучылася да збору сродкаў на будову Помніка Свабоды ў Рызе. 18 лютага 1930 г. кіраўніцтва БША заклікала беларускае настаўніцтва прадаваць купоны на патрэбы

[1171] LCVA, f. 368, ap. 1, b. 33, l. 40.

[1172] Тэатрал, *Пастаноўка п’есы “Апошняе спатканьне”*, “Беларуская школа ў Латвіі” 1933, № 3(20), с. 304.

[1173] *Хроніка беларускага жыцьця у Латвіі*, “Беларуская школа ў Латвіі” 1933, № 5(22), с. 336.

[1174] LVVA, 2125 f., 5 ap., 84 l., 63 lp.

[1175] LVVA, 6845 f., 2 ap., 19 l., 38 lp.

[1176] LVVA, 2125 f., 5 ap., 85 l., 159 lp.

[1177] LVVA, 2067 f., 1 ap., 377 l., 22 lp.

[1178] LVVA, f. 6845, 2 ap., 19 l., 151 lp.

[1179] LVVA, f. 6845, 2 ap., 19 l., 167 lp.

[1180] LVVA, f. 6845, 2 ap., 19 l., 202 lp.

будовы[1181]. 12 кастрычніка 1931 г. Беларускі школьны аддзел звярнуўся да кіраўнікоў школ, настаўнікаў і школьнай моладзі з заклікам не заставацца ўбаку ад мерапрыемстваў звязаных з помнікам. Прапаноўвалася, каб настаўнікі распавядалі вучням пра змаганне Латвіі за незалежнасць, тлумачылі "*ідэю і значэнне Помніка Свабоды, каб усё гэта школьнай моладзі было нагэтулькі зразумела, што б маглі весці аб тым гутарку ў хаце з бацькамі і іншымі, аднаўляючы такім чынам успаміны аб цяжкіх часах паўстання дзяржавы і папулярызуючы ідэю Помніка Свабоды*"[1182].

Пазашкольная праца. Істотным элементам культурна-асветніцкай працы з'яўлялася пазашкольная адукацыя. Беларускі актыў і кіраўніцтва беларускіх школ разумелі яе важнасць. На патрэбу інтэнсіфікацыі пазашкольнай дзейнасці звярталі ўвагу многія беларускія дзеячы[1183]. Варта прывесці некалькі яе прыкладаў. Бацькоўскі сход Даўгаўпілскай беларускай школы ў 1928 г. вырашыў, што ў мурах школы павінны адбывацца не менш як дзве публічныя лекцыі ў месяц. У выніку 25 верасня 1928 г. настаўнік А. Барткевіч прачытаў лекцыю *Хто мы, чаму на нас нападаюць і каму гэта карысна*, а 30 кастрычніка настаўнік агучыў рэферат *Незалежнасць Чэха-Славакіі і чаму мы не здабылі свае незалежнасці*. 25 лістапада ён жа азнаёміў прысутных з дакладам *Родная мова*[1184].

28–29 верасня 1929 г., падчас з'езду беларускага настаўніцтва Лудзенскага павета, абмяркоўвалася пытанне больш інтэнсіўнай пазашкольнай працы. Першы крок зрабіў кіраўнік Келаўскай школы, які восенню 1929 г. пачаў падрыхтоўчую працу. Далучыліся і кіраўнікі Залескай, Ляўзенскай, Шылаўскай і Шушкаўскай школ[1185]. У 1930 г. інспектар беларускіх школ Я. Кастылюк прапанаваў даручыць маладым настаўнікам пазашкольную працу сярод дарослага насельніцтва ў вёсках. На старонках беларускай прэсы ён заклікаў нацыянальны актыў арганізоўваць пры школах курсы для дарослых. Дзеяч лічыў патрэбным адкрыццё не толькі вячэрніх школ і курсаў, але і шчыльнае супрацоўніцтва з беларускімі таварыствамі і бібліятэкамі-чытальнямі. Рада БША падтрымала гэтую ініцыятыву, даручыўшы У. Пігулеўскаму, П. Жэрдзі і Я. Кастылюку арганізацыю дадатковыя курсы для дарослых[1186].

[1181] LVVA, 2125 f., 5 ap., 85 l., 150 lp.; LVVA, 6845 f., 2 ap., 19 l., 49 lp.

[1182] LVVA, 2125 f., 5 ap., 411 l., 54 lp.

[1183] Напрыклад, кіраўнік таварыства "Беларуская хата" М. Дзямідаў прачытаў лекцыю пра важнасць пазашкольнай адукацыі беларусаў у Латвіі падчас настаўніцкай канферэнцыі 24–25 сакавіка 1932 г. НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 93, л. 15.

[1184] *Пазашкольная праца дзьвінскага настаўніцтва*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1929, № 9(1), с. 5.

[1185] Я. Кастылюк, *Адчыняйце дадатковыя школы для дарослых*, "Наша доля" 1930. № 1 ад 26 студзеня, с. 2.

[1186] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 72 lp.

Нягледзячы на гэта, пазашкольная асвета сярод латвійскіх беларусаў не была на належным узроўні. На думку школьнага інспектара П. Журкоўскага, віна ляжала на настаўніках, якія ўхіляліся ад пазашкольнай працы, а таксама на беларускіх культурна-асветных арганізацыях, якія не ўцягвалі насельніцтва ў арбіту сваёй дзейнасці[1187].

У наступныя гады пытанне пазашкольнай асветы не знікала з парадку дня. 15 чэрвеня 1932 г. на настаўніцкай канферэнцыі ў Даўгаўпілсе выступілі У. Пігулеўскі (*Беларуская школа ў Латвіі і яе перспектывы на будучыню*), М. Дзямідаў (*Пазашкольная асвета беларусаў*), С. Сахараў (*Беларуская сярэдняя школа ў Латвіі*), У. Раткін (*Прафесійная адукацыя беларусаў*)[1188]. Абмяркоўваючы пытанне пра стан пазашкольнай асветы, прысутныя не пагадзілася з ідэяй М. Дзямідава разбудаваць сетку беларускіх бібліятэк. Большасць падтрымала думку С. Сахарава, які лічыў, што не варта ставіць новых мэт, а ўтрымаць ужо дасягнутае. Дэлегаты вырашылі стварыць чатыры публічныя бібліятэкі: 1) пры 2-й Прыдруйскай школе (Э. Вайводзіш), 2) пры Пустынскім аддзеле ТБМЛ (Чэслаў Клагіш), 3) пры Кокінскай школе (С. Красневіч), 4) пры Даўгаўпілскай беларускай школе (Сафія Саўкант)[1189].

Сярэднія школы

Даўгаўпілская дзяржаўная беларуская гімназія. Пасля ліквідацыі ў 1925 г. Лудзенскай беларускай гімназіі адзінай сярэдняй школай беларускай меншасці заставалася Даўгаўпілская. Пасля завяршэння беларускага працэсу школьнае жыццё ў гэтай гімназіі вярнулася ў ранейшае рэчышча. Увесну 1925 г. міністэрства асветы вырашыла вызваліць П. Жэрдзі ад пасады часовага дырэктара (з 1 красавіка). Настаўнікі палічылі, што такія змены ў сярэдзіне года адмоўна паўплываюць на навучальны працэс. Таму 5 сакавіка 1925 г. педрада гімназіі вырашыла прасіць міністра асветы пакінуць П. Жэрдзі на пасадзе да канца навучальнага года[1190]. Але міністэрства адмовіла, і 19 сакавіка 1925 г. школьная рада аднагалосна абрала С. Сахарава новым дырэктарам, а П. Жэрдзі застаўся працаваць на пасадзе настаўніка[1191]. 8 красавіка 1925 г. С. Сахараў быў зацверджаны на пасадзе кіраўніка гімназіі. Пад яго кіраўніцтвам працаваў настаўніцкі калектыў, які складаўся з дасведчаных

[1187] П. Журкоўскі, *Незакранутае пытаньне*, "Наша доля" 1930, № 1 ад 26 студзеня, с. 1.

[1188] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 93, л. 16.

[1189] *Конфэрэнцыя беларускіх вучыцялёў у Дзьвінску*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 2(12), с. 170.

[1190] LVVA, 2067 f., 1 ap., 367 l., 55 lp.

[1191] LVVA, 2067 f., 1 ap., 375 l., 10 lp.

педагогаў. Дзякуючы даступным крыніцам, можна прасачыць дынаміку кадравых змен у педкалектыве[1192]. Падрабязныя звесткі пра настаўніцкі склад гімназіі пададзеныя ў табліцы.

Табліца 41. Педагагічны склад Даўгаўпілскай беларускай гімназіі (1925–1935 гг.)

Настаўнікі	Дата нараджэння	Нацыянальнасць	Грамадзянства	Веравызнанне	Прадмет
Абельц Карліс	1890	Латыш	Латвійскае	Лютэранін	
Азоліньш Канстанцінс	28.06.1902	Латыш	Латвійскае	Лютэранін	
Антонійс		Латыш	Латвійскае	Рыма-каталік	
Бергман Эльза-Эмілія	02.06.1905	Латышка	Латвійскае	Лютэранін	
Вайнштэйн Артур	02.01.1886	Латыш	Латвійскае	Лютэранін	маляванне
Відаўскі Уладзімір	16.01.1905	Беларус	Латвійскае	Праваслаўны	прыродазнаўства хімія фізіка геаграфія
Гайлевіч Язэп	26.02.1893	Беларус	Польскае	Рыма-каталік	Закон Божы
Гананьш Тэкля	02.05.1900	Латышка	Латвійскае	Лютэранін	
Глаголеў Уладзімір	10.04.1898	Беларус	Латвійскае	Праваслаўны	

[1192] У 1929/30 гг. педагагічны калектыў Даўгаўпілскай беларускай гімназіі налічваў 14 настаўнікаў: С. Сахараў, А. Якубецкі, У. Відаўскі, У. Раткін, М. Кальян, В. Зінкевіч, Ю. Пантэвічс, Я. Кальніньш, Я. Карнавухаў, В. Краўзэ, а. С. Трубіцын, кс. Я. Гайлевіч, А. Паўлюкевіч і У. Ціхаміраў. На пачатку 1930-х гг. педагагічны калектыў гімназіі быў наступны: С. Сахараў (са стажам працы ў гімназіі з 1.2.1925 г.), а. С. Трубіцын (з 1.12.1922 г.), кс. Я. Гайлевіч (з 1.8.1926 г.), Ю. Пантэвічс (з 1.2.1925 г.), А. Якубецкі (з 1.12.1925 г.), В. Зінкевіч (з 1.10.1922 г.), У. Раткін (матэматыка, з 1.11.1924 г.), Г. Цэльяд (з 1.10.1923 г.), В. Краўзэ (з 10.8.1925 г.), старэйшы лейтэнант Я. Карнавухаў (з 1.8.1929), Ян Кальніньш (з 1.8.1929 г.), Я. Катоўскі (з 15.11.1930 г.), П. Шварцбах (лацінская мова, з 1.8.1930 г.), У. Відаўскі (з 16.9.1929 г.), У. Ціхаміраў (з 1.8.1926 г.), А. Паўлюкевіч (з 1.9.1924 г.), А. Грундуліс (з 1.9.1924 г.). (LVVA, 2125 f., 5 ap., 259 l., 58 lp.). У 1931/32 гг. у гімназіі працавалі: С. Сахараў, А. Якубецкі, У. Відаўскі, У. Раткін, П. Шварцбах, В. Зінкевіч, Ю. Пантэвічс, Яніс Кальніньш, Г. Цэльяд, Ян Карнавухаў, В. Краўзэ, а. С. Трубіцын, кс. Я. Гайлевіч, Я. Катоўскі, А. Грундуліс, А. Паўлюкевіч, У. Ціхаміраў (LVVA, 2125 f., 5 ap., 259 l., 67 lp.; LVVA, 1632 f., 2 apr., 499 l., 105 lp.). У 1932/33 гг. у гімназіі працавалі: С. Сахараў, А. Якубецкі, У. Відаўскі, В. Краўзэ, Г. Цэльяд, Я. Катоўскі, Ю, Пантэвічс, Я. Карнавухаў, П. Шварцбах, А. Паўлюкевіч, У. Ціхаміраў, А. Грундуліс, У. Раткін, В. Зінкевіч (LVVA, 2067 f., 1 ap., 377 l., 61 lp.).

Настаўнікі	Дата нараджэння	Нацыянальнасць	Грамадзянства	Веравызнанне	Прадмет
Грундуліс Аляксандра	25.04.1904	Беларуска	Латвійскае	Праваслаўная	ткацтва і рукадзелле
Жэрдзі Парфірый	1892	Украінец		Праваслаўны	
Заморын Міхаіл	06.09.1889	Беларус	Латвійскае	Праваслаўны	лаціна руская мова
Зінкевіч Вільгельм	06.02.1871	Беларус/ латыш	Латвійскае	Лютэранін	нямецкая мова
Казлоўскі Аляксандр	12.03.1888	Беларус	Латвійскае	Праваслаўны	
Калашнікаў Уладзімір	18.03.1870	Рускі	Латвійскае	Праваслаўны	
Калейс Оскар	24.04.1902	Латыш	Латвійскае	Лютэранін	маляванне
Кальніньш Яніс	21.02.1884	Латыш	Латвійскае	Рыма-каталік	маляванне
Комісарс Яніс		Латыш	Латвійскае		інструктар майстэрні
Капылоў Павел		Беларус	Латвійскае	Праваслаўны	інструктар сталярнай майстэрні
Карнавухаў Ян	04.10.1904	Беларус	Латвійскае	Праваслаўны	вайсковая падрыхтоўка
Кастылюк Якуб	02.09.1884	Беларус	Латвійскае	Праваслаўны	геаграфія
Катоўскі Ян	1888	Беларус	Латвійскае	Праваслаўны	спевы
Кільян Максімільян	27.10.1872	Латыш	Латвійскае	Лютэранін	маляванне
Краўзэ Яніс	26.09.1892	Латыш	Латвійскае	Лютэранін	гімнастыка
Лютэрман Надзея	07.04.1887	Руская	Латвійскае	Лютэранка	нямецкая мова
Матэас-Краўзэ Вера	21.03.1905	Латышка	Латвійскае	Лютэранка	гімнастыка і пластыка
Пантэвічс Юрыс	03.09.1892	Беларус	Латвійскае	Лютэранін	латышская мова
Паўлюкевіч Аляксандр	1890	Беларус	Латвійскае	Рыма-каталік	інструктар сталярнай майстэрні
Плоніс Яніс	29.12.1892	Латыш	Латвійскае	Рыма-каталік	дырэктар (1934–1935)
Раткін Уладзімір	1884	Беларус	Латвійскае	Праваслаўны	матэматыка фізіка тэхналогія

Настаўнікі	Дата нараджэння	Нацыянальнасць	Грамадзянства	Веравызнанне	Прадмет
Рафаловіч Юзаф	15.03.1891	Беларус	Латвійскае	Рыма-каталік	
Рудзь Станіслаў	25.01.1890	Беларус	Латвійскае	Рыма-каталік	
Сахараў Сяргей	16.09.1890	Беларус	Латвійскае	Праваслаўны	дырэктар
Стэфановіч Эла			Латвійскае		
Трубіцын Сава	14.10.1887	Беларус / рускі (?)	Латвійскае	Праваслаўны	Закон Божы
Трэйманс Ансіс	24.10.1889	Латыш	Латвійскае	Лютэранін	
Фёдарава Юлія	1897	Беларуска	Латвійскае	Праваслаўная	
Фельдман Ніна	02.05.1896	Латышка	Латвійскае	Лютэранка	нямецкая мова
Фрэйманіс Ансіс		Латыш	Латвійскае	Лютэранін	спевы
Ціхаміраў Уладзімір	13.09.1896	Беларус	Латвійскае	Праваслаўны	інструктар майстэрні
Цэльяд Густаў	25.07.1886	Швед	Латвійскае	Лютэранін	лекар гімнастыка
Чаманс Язэпс	1894	Латыш	Латвійскае	Рыма-каталік	
Шварцбах Паўліс	1894	Латыш	Латвійскае	Лютэранін	лаціна
Шкульцін Аляксандр	25.12.1885	Беларус	Латвійскае	Праваслаўны	лаціна руская мова
Шылініс Антоніс	1871	Літовец	Літоўскае	Рыма-каталік	Закон Божы
Эрцумс Карліс	1899	Латыш	Латвійскае	Лютэранін	
Юрэвіч Густаў	17.03.1902	Латыш	Латвійскае	Лютэранін	
Ядкевіч Баляслаў	27.10.1893	Беларус	Латвійскае	Рыма-каталік	
Якубецкі Андрэй	18.10.1892	Беларус	Латвійскае	Праваслаўны	беларуская мова геаграфія

Крыніца: LVVA, 2067 f., 1 ap., 390 l., 1–13 lpp.

Настаўніцкі калектыў гімназіі быў шматнацыянальны і шматканфесійны. У 1928/29 гг. у школе працавала дзесяць беларусаў (С. Сахараў, А. Якубецкі, У. Раткін, Я. Кастылюк, кс. Я. Гайлевіч, а. С. Трубіцын, А. Трубецкая, У. Ціхаміраў, А. Паўлюкевіч, Юрыс Пантэвічс), украінец (П. Жэрдзі), швед (др. Густаў Цэльяд), немец (А. Вайнштэйн) і сем латышоў (В. Зінкевіч,

М. Кільян, К. Эрцумс, Я. Комісарс, А. Фрэйманіс, К. Абельц, В. Матэас). Справаводам гімназіі быў беларус І. Фёдараў[1193].

Такі значны працэнт настаўнікаў-небеларусаў тлумачыцца тым, што беларускія педагогі не ведалі добра латышскай мовы. У выніку прадметы, якія мусілі выкладацца па-латышску, вялі латышы. Веданне дзяржаўнай мовы працяглы час было праблемай для беларускіх настаўнікаў. 30 траўня 1927 г. Рада БША пастанавіла абавязаць усіх педагогаў валодаць латышскай мовай, а таксама звярнуцца да міністра асветы з просьбай дапусціць да працы ў школах настаўнікаў, якія вытрымалі іспыты па першай частцы праграмы[1194].

Вядомыя адзінкавыя выпадкі, калі ў разгляданы час працы ў гімназіі шукалі замежныя беларусы. Напрыклад, 11 верасня 1928 г. школьная рада разгледзела просьбу Тамаша Грыба, які прасіў прыняць яго на працу настаўнікам лаціны. Рада ўхваліла яго кандыдатуру і звярнулася ў БША з просьбай хадайнічаць перад Міністэрствам асветы[1195]. Аднак пражскі беларус не атрымаў працы ў Даўгаўпілсе.

Частка педагогаў мела вышэйшую або няскончаную вышэйшую адукацыю. Кіраўнік гімназіі С. Сахараў скончыў Віцебскі педагагічны інстытут, настаўнік лаціны П. Шварцбах і настаўнік латышскай мовы Ю. Пантэвічс быў студэнтам Латвійскага ўніверсітэта, гімназійны лекар і настаўнік гімнастыкі Г. Цэльяд скончыў Старсбургскі ўніверсітэт, настаўнік прыродазнаўства і геаграфіі У. Відаўскі – Карлаў універсітэт, настаўніца В. Краўзэ – Латвійскі ўніверсітэт, Я. Карнавухаў – Латвійскую ваенную акадэмію. Настаўнік лаціны і рускай мовы М. Заморын быў выхаванцам Філалагічнага факультэта Кіеўскага ўніверсітэта, а настаўнік спеву А. Фрэйманіс вучыўся ў Латвійскай кансерваторыі[1196]. Настаўнік лаціны і рускай мовы А. Шкульцін быў выпускніком Юр'еўскага ўніверсітэта. Настаўнік матэматыкі У. Раткін навучаўся ў Петрагардскім політэхнічным інстытуце. Астатнія педагогі скончылі настаўніцкія семінарыі або курсы. Напрыклад, настаўнік спеваў Я. Катоўскі праслухаў рэгенцкія курсы пры Кіеўскай кансерваторыі. Настаўнік малявання Я. Кальніньш скончыў Пензенскую школу малявання. Акрамя педагогаў, у гімназіі працавалі: справавод І. Фёдараў (з 1.9.1923 г.) і вартаўнікі: Аляксандр Казлоўскі (з 10.1.1924 г.) і Баляслаў Вайткевіч (з 1.5.1929 г.)[1197]. Выпускнік Рыжскай духоўнай семінарыі а. Сава Трубіцын выкладаў (з 1 снежня 1922 г.) Закон Божы для праваслаўных, а выхаванец Менскай духоўнай семінарыі

[1193] LVVA, 1632 f., 2 apr., 495 l., 53 lp.; *Сьпіс беларускіх школ і настаўніцтва ў Латвіі ў бягучым 1928–29 навучальным годзе*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1929, № 9(1), с. 12.

[1194] LVVA, f. 2125, apr. 5, l. 4, 37–38 lpp.

[1195] LVVA, 2067 f., 1 ap., 376 l., 38 lp.

[1196] LVVA, 2067 f., 1 ap., 376 l., 9 lp.

[1197] LVVA, 2067 f., 1 ap., 365 l., 57 lp.

кс. Язэп Гайлевіч выкладаў (з 1 жніўня 1926 г.) Закон Божы для каталікоў. Родную мову выкладаў (з 1 снежня 1925 г.) выхаванец Свіслацкай настаўніцкай семінарыі А. Якубецкі. Настаўнік нямецкай мовы Вільгельм Зінкевіч скончыў Ірлаўскую настаўніцкую семінарыю, а настаўнік прыродазнаўства і геаграфію П. Жэрдзі быў выпускніком Елізаветаградскага вышэйшага сельскагаспадарчага тэхнікума[1198].

Дзякуючы таму, што архіў гімназіі захаваўся, можна прасачыць дынаміку зменаў колькасці вучняў. У 1925/26 гг. у чатырох класах налічвалася 129 юнакоў і дзяўчат[1199]. У тым навучальным годзе гімназію скончылі 25 чал., частка з якіх пазней далучылася да беларускай грамадскай і культурна-асветнай дзейнасці ў Латвіі[1200]. У 1926/27 г. гімназію скончыў яшчэ 21 маладзён[1201]. У наступныя гады колькасць выпускнікоў была меншай і вагалася ад 10 да 19 чал. У падзеле на навучальныя гады сітуацыя выглядае наступным чынам: у 1927/28 гг. – 13, у 1928/29 гг. – 10, у 1929/30 гг. – 15, у 1930/31 гг. – 10, у 1931/32 гг. – 13, у 1932/33 гг. – 12, у 1933/34 гг. – 19[1202]. Такім чынам у 1926 – 1934 гг. муры гімназіі пакінула не менш як 138 выпускнікоў.

Беларускі актыў заахвочваў беларускамоўных сялян пасылаць дзетак у родную гімназію. На старонках газеты "Голас беларуса" аўтар намагаўся давесці сялянству важнасць сярэдняй асветы: "*Мы, беларусы, павінны зрабіць усе высілкі на тое, каб уся наша сялянская моладзь не толькі добра скончыла вясковыя беларускія школы, але каб яна ў большым ліку канчала нашую гімназію і йшла ў вышэйшую школу. Мы павінны мець сваіх дактароў, інжынераў, архітэктараў, аграномаў, адвакатаў, добрых мастакоў-маляроў, натарыусаў, камерсантаў і ўсялякіх іншых спецыялістаў. Мы – народ дужа здольны. Мы шмат чаго дужа лёгка навучаемся, ловім навуку, як кажуць, 'злёту'. Вучыцца нам няцяжка. Адна перашкода – грошы. Тутака трэба нам усе высілкі. Мы іх ужо пачалі рабіць. Беларускае грамадзянства ў Латвіі робіць усялякія складкі. Моладзь наша вучыцца і адначасова працуе фізічным трудом. Аднак трэба налегчы яшчэ больш. Усяго, што ўжо робіцца, яшчэ мала. Трэба, каб усе бацькі, што маюць зямлі толькі на аднаго сына, пастараліся*

[1198] *Гістарычны нарыс пяцігодзьдзя Дзьвінскай Дзяржаўнай Беларускай Гімназіі за 1922–1927 г.г.*, укл.: С. Сахараў, Дзьвінск 1927, с. 12–14.

[1199] Праўда, на працягу года 9 вучняў выбыла, у тым ліку 2 вучаніцы – памерлі. LVVA, 2125 f., 5 ap., 259 l.; *З жыцьця Дзьвінскай беларускай гімназіі ў 1925–1926 вуч. годзе,* "Школьная праца" 1926, № 3–4, с. 29.

[1200] Сярод іх знаходзіліся П. Мірановіч, М. Калінін, В. Казлоўская, Я. Доўгі і П. Журкоўскі. Беларускі вучыцель, *IV выпуск Дзьвінскай дзяржаўнай беларускай гімназіі*, "Голас беларуса" 1926, № 10 ад 1 ліпеня, с. 2.

[1201] *Хроніка беларускага жыцьця у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 5(22).

[1202] LVVA, 2125 f., 5 ap., 333 l., 2 lp.; *Гістарычны нарыс пяцігодзьдзя Дзьвінскай Дзяржаўнай Беларускай Гімназіі за 1922–1927 г.г.*, укл.: С. Сахараў, Дзьвінск 1927, с. 30–34.

ўсіх іншых, і сыноў, і дачок, паслаць у школу. Хай скончаць не толькі пачатковую, але і сярэднюю і спецыяльныя школы. Трэба ўсім сціснуцца, трэба напружыцца, трохі пацярпець, пагараваць болей папрацаваць, і тады, праз гадоў чатыры-пяць, мы ўжо адразу пачуемо палёгку. У нас будуць новыя кадры маладой інтэлігенцыі, якая ўзмацуецца на працы сама і пацягне другіх"[1203].

Аднак ахвотных паступаць у гімназію было мала не толькі праз несвядомасць сялянства. Беларуская пачатковая адукацыя ў асноўным складалася са школ 1-га ўзроўню – 4-годак. У гімназію ж мелі магчымасць трапіць толькі тыя, хто скончыў поўны 6-гадовы курс пачатковай асветы. Трапна сітуацыю падсумаваў кіраўнік БША: "*Нязначны лік вучняў у гімназіі тлумачыцца як нязначным лікам поўных 6-класавых беларускіх пачатковых школ у Латвіі (усяго 4), так і тым, што беларусы ў Латгаліі эканамічна надта бедныя і нямногія маюць магчымасць трымаць дзяцей 7 год у пачатковай школе і потым яшчэ 4 гады ў гімназіі*"[1204]. Кіраўніцтва гімназіі разумела патрэбу стварыць пры 6-годках інтэрнаты для вучняў з далёкіх вёсак, бо яны былі патэнцыйнымі навучэнцамі гімназіі. Пытанне абмяркоўвалі падчас бацькоўскага сходу Лудзенскай беларускай пачатковай школы з удзелам дырэктара Даўгаўпілскай беларускай гімназіі 15 кастрычніка 1927 г. У пратаколе чытаем: "*Гр. Сахараў дакладае, што вучні-беларусы, скончыўшыя 3-х або 4-х класныя беларускія вясковыя школы, павінны ці заставацца зусім без далейшае асветы, ці йсьці вучыцца ў школу іншае нацыянальнасці, – бо ўва ўсім Дзвінскім павеце няма ні аднае беларускае 6-ці кляснае школы, за выняткам школы ў Дзвінску. Дакладчык лічыць, што вышэйшы факт узлажае на Дзвінскую беларускую школу абавязак дапамагчы вясковаму беларускаму юнацтву скончыць 6-ці класную пачатковую школу на роднай мове і гэтым самым пракласці яму шлях для далейшае адукацыі. Дапамога нашае школы будзе складацца ў стварэнні пры школе інтэрнату*"[1205].

Дынаміка росту колькасці вучняў гімназіі непасрэдна залежала ад колькасці беларускіх пачатковых школ. Дырэктар гімназіі С. Сахараў лічыў, што павелічэнне лічбы вучняў магчымае пры ўмове адкрыцця другой 6-класнай школы ў Даўгаўпілсе і яшчэ як мінімум дзвюх – у павеце[1206].

У разгляданы час кантынгент вучняў гімназіі не змяніўся ў параўнанні з першымі гадамі існавання ўстановы. Большасць вучняў паходзіла з Даўгаўпілшчыны. Аднак пасля закрыцця Лудзенскай беларускай гімназіі

[1203] *Хутчэй пасылайце просьбы аб прыеме у Дзьвінскую Беларускую Дзяржаўную гімназію*, "Голас беларуса" 1926, № 14 ад 28 ліпеня, с. 1.

[1204] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 2 lp.

[1205] LVVA, 2125 f., 5 ap., 127 l., 130 lp.

[1206] *Гістарычны нарыс пяцігодзьдзя Дзьвінскай Дзяржаўнай Беларускай Гімназіі за 1922–1927 г.г.*, укл.: С. Сахараў, Дзьвінск 1927, с. 8.

34 яе навучэнцы перайшлі ў Даўгаўпілскую. З гэтага часу каля 40% вучняў гімназіі складалі жыхары Лудзеншчыны[1207].

Вучнёўская брацыя складалася з прадстаўнікоў розных веравызнанняў. Пераважалі прадстаўнікі праваслаўя і каталіцызму. У 1925/26 гг. да першай канфесіі належалі 73 навучэнцы, да другой – 52. Прадстаўнікі іншых веравызнанняў было няшмат: стараверы – 3, лютэранін – 1. У наступным навучальным годзе ў школьных мурах вучыліся 52 праваслаўныя, 37 каталікоў, 2 стараверы і 1 лютэранін[1208]. З цягам часу сітуацыя не змянілася істотным чынам. У 1934/35 гг. у гімназіі навучалася 28 праваслаўных і 30 каталікоў[1209]. У гімназіі панавала рэлігійная талерантнасць. Выкладаліся асновы праваслаўнай і каталіцкай веры. Святары абедзвюх канфесій адпраўлялі набажэнствы на ўрачыстасці адкрыцця кожнага новага навучальнага года[1210]. Аднак стракаты рэлігійны склад часам выклікаў праблемы. 18 верасня 1925 г. школьная рада гімназіі абмяркоўвала пытанне рэлігійных святаў. Паколькі гімназію наведвалі і праваслаўныя, і каталікі, неабходна было адзначаць святы абодвух канфесій, што ўдвая павялічвала колькасць непрацоўных дзён і скарачала колькасць гадзін навучання. Было вырашанна, што ўсе вучні могуць быць вызваленыя ад заняткаў толькі з нагоды наступным святаў: праваслаўных – Нараджэння Багародзіцы, Узвіжання, Увядзення ў Храм Багародзіцы, Пакроваў, Грамніц, Вадохрышча, Благавешчання, Сёмухі, памінальнага дня; каталіцкія – Усіх Святых, 8 снежня, Благавешчання, Нараджэння Багародзіцы, Сёмухі, Божага Цела, памінальнага дня. Апрача таго, вольнымі днямі для прадстаўнікоў абедзвюх канфесій былі Каляды і Вялікдзень[1211].

Па-ранейшаму пераважную большасць навучэнцаў складалі дзеці малазямельных незаможных сялян (ажно 70%). Многія вучні былі вызвалена ад школьных аплат[1212]. Цяжкае матэрыяльнае становішча адмоўна ўплывала на навучальны працэс. Шмат хто з вучняў, не меўшы адзення і абутку, не мог наведваць школы далёка ад дому. Нярэдка вучні, не маючы грошай за

[1207] *Гістарычны нарыс пяцігодзьдзя Дзьвінскай Дзяржаўнай Беларускай Гімназіі за 1922–1927 г.г.*, укл.: С. Сахараў, Дзьвінск 1927, с. 8.

[1208] *Гістарычны нарыс пяцігодзьдзя Дзьвінскай Дзяржаўнай Беларускай Гімназіі за 1922–1927 г.г.*, укл.: С. Сахараў, Дзьвінск 1927, с. 8.

[1209] LVVA, 2067 f., 1 ap., 365 l., 414 lp.

[1210] *Пачатак заняткаў у гімназіі*, "Школьная праца" 1926, № 5.

[1211] LVVA, 2067 f., 1 ap., 375 l., 11 lp.

[1212] Вось як пісаў К. Езавітаў: "*Калі-б не была адчынена беларуская гімназія, дык шмат хто з тае беднаты, што цяперака ўжо скончыла гімназію і мае пасаду, або далей вучыцца на вучыцельскіх курсах і ў вышэйшай школе, ніколі ў жыццю не мог бы атрымаць сярэдняе асветы. Гімназія дужа многіх звальняе ад аплаты; для прыезжых з вёскі мае інтэрнат, а шмат каго, нават, і корміць і поіць*". Кастусёнак, *Дзьвінская Беларуская Гімназія зьбірае сродкі на дапамогу бяднешым вучням*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1927, № 3(1), с. 26.

аплату, кідалі гімназію або часова спынялі навучанне. У заяве вучня 2 класа Станіслава Рацына да педрады гімназіі (6 верасня 1926 г.) чытаем: "*Пры пераходзе ў II класу гімназіі мне былі прызначаны іспыты па геаметрыі. Улетку я мусіў працаваць па найму ў гаспадара-латыша, каб заробіць сабе крыху грошы. Працуючы, я ня меў ніводнай вольнай хвіліны, каб хоць крыху прагледзець геаметрыю. З поваду вышэйпададзенага, прашу звольніць мяне на дзе-які час ад гэтых іспытаў і прызначыць тэрмін, у які я змог бы падрыхтавацца і з поспехам вытрымаць*"[1213].

З прычыны беднасці не ўсе бацькі маглі даць дзецям сярэднюю асвету. Яны звярталіся як да кіраўніцтва гімназіі, так і латвійскіх улад з просьбамі пра дапамогу. 29 траўня 1928 г. селянін з вёскі Казакі Пасіенскай воласці Дамінік Мяжэцкі напісаў ліст прэзідэнту Латвіі. Ён скардзіўся, што, маючы на ўтрыманні сям'ю з 11 чалавек, валодае толькі 26 гектарамі зямлі. Яго сын Язэп і дачка Сабіна вучыліся на 2-гадовых беларускіх дзяржаўных настаўніцкіх курсах, а дочкі Герарда і Алімпія – у Даўгаўпілскай беларускай гімназіі. Іншыя дзеці наведвалі пачатковую школу ў Пасіене. У лісце чытаем: "*Даючы асвету дзецям, быў змушаны перабіць даўгі, чаму зараз мне пагражае продаж маёмасці з таргоў. Таму звяртаюся да Вас, высокапаважаны гр. Прэзідэнт, з просьбай выдаць мне дапамогу на навучанне і выхаванне дзяцей*"[1214]. У адказ Міністэрства асветы звярнулася да БША з просьбай падчас размеркавання дапамогі звярнуць асаблівую ўвагу на дзяцей Д. Мяжэцкага[1215].

Каб падтрымаць незаможных вучняў, кіраўніцтва гімназіі стварыла камісію па размеркаванні сродкаў сярод бедных навучэнцаў (кіраўнік А. Барткевіч). На прапанову С. Сахарава было вырашана стварыць фонд дапамогі найбяднейшым вучням[1216]. 5 кастрычніка 1925 г. школьная рада вырашыла звярнуцца ў Міністэрства асветы і Культурны фонд Латвіі, да латышскіх і беларускіх арганізацый з просьбай дапамагчы выправіць гаротнае матэрыяльнае становішча 36 вучняў гімназіі, якія жылі ў інтэрнаце[1217]. У лютым 1927 г. з ініцыятывы школьнай рады гімназіі быў створаны фонд дапамогі найбяднейшым вучням. Рада звярнулася таксама да ўсіх беларускіх арганізацый з заклікам далучыцца[1218]. На пасяджэнні 19 красавіка 1927 г. рада прыняла наступную заяву: "*Прымаючы пад увагу, што вучні гімназіі складаюцца галоўным чынам (да 80%) з бяднейшага жыхарства Латгаліі, як мястовага, так і вясковага, што яны вельмі патрабуюць дапамогі не толькі*

[1213] LVVA, 2067 f., 1 ap., 405 l., 8 lp.
[1214] LVVA, 6845 f., 2 ap., 13 l., 67 lp.
[1215] LVVA, 6845 f., 2 ap., 13 l., 69 lp.
[1216] LVVA, 2067 f., 1 ap., 375 l., 11 lp.
[1217] LVVA, 2067 f., 1 ap., 375 l., 22 lp.
[1218] LVVA, 2067 f., 1 ap., 376 l., 10 lp.

для ўзносу платы за навуку, але і на ежу і інш. патрэбы, прасіць Беларускі Аддзел: 1) узбудзіць належнае хадатайства перад Думаю Культурнага фонду аб вотпуску сум з Культурнага фонду % грошай, прычытаюшчыхся на беларускія сярэднія школы ў ліку да 500 лат; 2) адпушчаныя Культурным фондам грошы на беларускія сярэднія школы ўсе перавесць Даўгаўпілскай дзяржаўнай беларускай гімназіі без падзелу іх паміж гімназіяй і беларускімі вучыцельскімі курсамі як гэта было раней, бо пры агульным ліку 92 вучняў маецца больш незаможных дзяцей, а курсам пры 12 курсантах ужо адпушчана ў гэтым годзе павялічаных стыпендыяў па бюджэце Беларускага аддзела"[1219]. Дзеля дапамогі найбяднейшым вучням Даўгаўпілская беларуская гімназія ладзіла грашовыя латарэі і вечарыны, якія адбываліся як у школе, так і гарадскім клубе[1220]. У 1925–1927 гг. намаганнямі школьнай рады гімназіі на патрэбы незаможных вучняў было сабрана: у 1925/1926 г. – 2 061 латаў, у 1926/1927 г. – 2 454. Большая частка грошай была прызначана на кампенсацыю аплат за навучанне (80 латаў на год), а рэшта – на ежу, абутак, праезд дахаты і г.д[1221].

З мэтай папаўнення фонду на патрэбы незаможных навучэнцаў кіраўніцтва гімназіі вырашыла, што настаўнікі будуць адлічваць па 10% заробку на патрэбы найбяднейшых вучняў. І ўсё ж у гімназіі па-ранейшаму адчувалася нястача грошай. Асабліва гаротнае становішча было ў першых класах школ, дзе некаторыя вучні не мелі вопраткі і абутку. Кіраўніцтва БША звярнулася да беларускіх арганізацый і грамадскасці з заклікам узяць патранат над канкрэтнымі вучнямі. Кіраўніцтва аддзела лічыла, што на ўтрыманне аднаго вучня неабходна штомесяц пералічваць 5–10 латаў стыпендыі[1222].

У найгоршым матэрыяльным становішчы былі вучні з Лудзеншчыны, вымушаныя вучыцца далёка ад дому. Аўтары газеты "Голас беларуса" так апісвалі іх сітуацыю: "*Адарваныя аб сваіх сямеек вучні апынуліся ў самым цяжкіх матэрыяльным становішчы, шмат з іх кормяцца адным сухім чорным хлебам да прабіваюцца гарбатай з сахарынам*"[1223]. У верасні 1925 г. рэдакцыя заклікала беларускую грамадскасць ахвяраваць на дапамогу былым вучням Лудзенскай гімназіі, якія працягвалі навучанне ў Даўгаўпілсе: "*Мы павінны ратаваць нашу моладзь! Справа падтрымання Дзвінскае бурсы – наша нацыянальная справа. Мы не можам дапусціць, каб наша моладзь аблатышывалася, або русіцыравалася і абпалячвалася. Мы не можам зачыніць перад нашай*

[1219] LVVA, 2067 f., 1 ap., 376 l., 12 lp.

[1220] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 134, л. 29; LVVA, 2067 f., 1 ap., 375 l., 45 lp.

[1221] *Гістарычны нарыс пяцігодзьдзя Дзьвінскай Дзяржаўнай Беларускай Гімназіі за 1922–1927 г.г.*, укл.: С. Сахараў, Дзьвінск 1927, с. 27–28.

[1222] LVVA, 2750 f., 1 ap., 7 l., 98 lp.

[1223] *Адозва Школьнае Рады Дзьвінскае Беларускае Гімназіі да беларускага грамадзянства*, "Голас беларуса" 1925, № 16 ад 30 кастрычніка, с. 3.

Лудзенскай вёскай дарогу да сярэдняе і вышэйшае адукацыі"[1224]. Кіраўніцтва гімназіі прасіла ў самакіравання Лудзенскага павета матэрыяльнай дапамогі для найбяднейшым вучням гімназіі. 1 красавіка 1928 г. Рада БША ўхваліла адпаведны зварот да павятовага і валаснога самакіравання ў Латгаліі[1225]. У ліставадзе 1928 г. дырэктар гімназіі звярнуўся да інспектара беларускіх школ з просьбай паспрыяць атрыманню гэтай дапамогі: "*У Дзвінскай Дзяржаўнай беларускай гімназіі вучацца вучні з Люцынскага павета. Дзякуючы неўраджаю гэтага года матэрыяльнае становішча іх вельмі дрэннае. Калі была ў Люцыне беларуская гімназія, дык павятовая ўправа прыходзіла на дапамогу бедным вучням асігнаваннем да 200 лат на іх стыпендыі. З зачыненнем Люцынскае беларускае гімназіі і з пераходам вучняў яе ў Дзвінскую гімназію, наша гімназія зварочвалася да Люцынскае павятовае ўправы аб дапамозе, але яна ніякага адказу не дала. А таму вельмі прашу Вас, калі будзеце ў Люцыне па службовых справах, зрабіць захады перад Лудзенскай павятовай управай аб выдачы дапамогі для вучняў Люцынскага павета нашае гімназіі ў гэтым, вельмі цяжкім, годзе, прымаючы пад увагу недарод гэтага года*"[1226]. На заклік беларускага актыву і кіраўніцтва гімназіі адгукнулася самакіраванне Істэрскай воласці, прызначыўшы 250 латаў на аплату навучання дзяцей, што паходзілі з гэтай воласці[1227]. Тым часам педагагічная рада Лудзенскай беларускай пачатковай школы вылучыла грашовую дапамогу выпускнікам, якія вырашылі працягваць навучанне ў Даўгаўпілскай беларускай гімназіі[1228].

З той самай бядой у гімназію звярталіся настаўнікі некаторых вясковых школ. Настаўнік Рыгор Восіпаў напісаў ліст дырэктару гімназіі С. Сахараву (верасень 1928 г.), у якім прасіў даць бясплатныя абеды для дзвюх вучаніц, матывуючы гэта наступным чынам: "*Вучаніцы Станкевіч і Рабневіч ёсць сіроты, апроч таго, із кутка несвядомага грамадзянства. Дзякуючы Вашаму добраму кірунку – яны зараз знаходзяцца ў сваёй роднай беларускай школе, дзе змогуць зрабіцца свядомымі ў сваёй нацыянальнасці і рабіць уплыў на сваю грамаду, акружыўшую родную вёску. Але ёсць яшчэ адна перашкода, гэта – беднота, якая заставіла іх да гэтага часу жыць там у Дзвінску без гарачай пішчы*"[1229].

З прычыны галечы бацькі не маглі аплачваць навучання дзяцей. А праз неаплату вучні не маглі працягваць навучання. Так, 25 лютага 1925 г. педрада выключыла з гімназіі пяцёх вучняў (у тым ліку Вячаслава і Сяргея

[1224] *Трагэдыя Люцынскае Беларускае Гімназіі*, "Голас беларуса" 1925, № 15 ад 9 жніўня, с. 1.

[1225] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 57 lp.

[1226] LVVA, 2125 f., 1 ap., 83 l., 1 lp.

[1227] LVVA, 2067 f., 1 ap., 364 l., 340 lp.

[1228] *Беларускае жыцьцё у Латвіі*, "Голас беларуса" 1926, № 21 ад 6 кастрычніка, с. 4.

[1229] LVVA, 2067 f., 1 ap., 406 l., 207 lp.

Краскоўскіх)[1230]. Канцылярыя школы ўвесь час была засыпаная заявамі бацькоў і вучняў з просьбамі пра вызваленне ад аплаты альбо пра адтэрміноўку. Напрыклад, 19 траўня 1925 г. вучань 2-га падрыхтоўчага класа Канстанцін Нікрашэвіч звяртаўся ў школьную раду гімназіі: "*Маю гонар прасіць школьную раду аб звальненне мне платы за гэты вучэбны год, так як бацька ў мяне памёр, а маці адна і пры гэтым старая, не можыць мне даць магчымасці, каб заплаціць за гімназію. Вельмі прашу Школьную раду звольніць мне за права вучэння*"[1231]. 2 лістапада 1928 г. маці аднаго з гімназістаў Аляксея Маслоўскага прасіла школьныя ўлады прызначыць сыну стыпендыю, бо яго бацька загінуў падчас I сусветнай вайны[1232]. Кіраўніцтва гімназіі намагалася ісці ім насустрач заяўнікам, бо ў адваротным выпадку школа магла страціць вучняў і спыніць існаванне. Кіраўніцтва прыкладала намаганні, каб вызваліць ад аплат найбяднейшых і самых здольных вучняў. На пасяджэнні 22 траўня 1928 г. на прапанову С. Сахарава Школьная рада гімназіі пастанавіла "*вучняў, якія добра вучацца і добрыя з боку беларускага, аставіць у гімназіі і звольніць ад аплаты*"[1233].

Аднак магчымасці гімназіі былі абмежаваныя, каб задаволіць чаканні ўсіх, хто патрабаваў дапамогі. Напрыклад, Вікенцій Оруб меў двух сыноў-гімназістаў і прасіў вызваліць іх ад аплаты за навучанне. 26 лістапада 1928 г. кіраўніцтва гімназіі адказала на яго заяву: "*Паведамляю Вас, што гімназія не мае сродак, каб усіх вучняў звольніць ад аплаты за навуку. Плата за навуку паступае ў дзяржаўную касу і Вам неабходна зараз жа выслаць за Вашага сына Франца 40 лат. Сын Ваш Ілля зволен ад аплаты за навуку, апрача таго, яму даюць безграшовыя абеды ў інтэрнаце. Больш гэтага гімназія нічога пры ўсім жаданні не можа даць Вашым дзецям*"[1234]. Вучань другога класа Ілля Оруб у снежні 1928 г. пісаў: "*Гэтым маю гонар прасіць Школьную Раду аб тым, каб зменшылі мне плату за навуку за першае паўгоддзе, якая складаецца з 20 (дваццаці) лат хоць напалову. У звязку з тым, што гэты год вельмі неўраджайны, бацька не мае магчымасці правучыць гэты год двух сыноў у сваёй роднай гімназіі, таму што вельмі трудна пракарміцца ім, аддзяліўшыся ад хаты. Не можа бацька паслаць хлеб напалову з мякінай, якім сам ён пітаецца, і тую паўгнілую бульбу, якая яшчэ зусім не згніла, бо калі ў інтэрнаце пабачаць багацейшыя вучні, дык будуць смяяцца. Але заместа таго, каб даць якую-колечы дапамогу, Вы яшчэ накладаеце плату за навуку на сына беднага селяніна, які мае 7 гектараў зямлі, якая ў гэтым годзе не*

[1230] LVVA, 2067 f., 1 ap., 367 l., 52 lp.
[1231] LVVA, 2067 f., 1 ap., 403 l., 18 lp.
[1232] LVVA, f. 2924, 1 ap., 80 l., 139 lp.
[1233] LVVA, 2067 f., 1 ap., 376 l., 33 lp.
[1234] LVVA, 2067 f., 1 apr., 403 l., 160 lp.

прынясла ўраджаю ні на грош. Дык вельмі прасіў бы Школьную Раду звярнуць на гэта ўвагу і дапамагчы цяжкім абставінам зніжэннем платы"[1235]. У 1930 г. гэты вучань з матэрыяльных прычын мусіў пакінуць гімназію і перайсці ў Краслаўскую дзяржаўную гімназію, але ўжо ў студзені 1932 г. ён звярнуўся да кіраўніцтва Даўгаўпілскай беларускай гімназіі з просьбай прыняць яго ў трэці клас і "зрабіць магчымым паступленне маё ў гімназію, бо я жадаю прадаўжаць адукацыю на роднай ніве"[1236]. У падобным духу вытрыманая заява (28 лістапада 1932 г.) Масея Макарухі, які прасіў вызваліць ад аплат за навучанне ў 1932/33 гг. яго сына, вучня 4 класа Паўла паколькі: "*я ўжо стары, маю 52 гады, і не зусім здаровы, вельмі мала зарабляю і маіх заробкаў хапае толькі на пракармленне сям'і*"[1237].

Здараліся адзінкавыя сітуацыі, калі гімназія адмоўна разглядала просьбы вучняў з прычыне іх непаспяховасці. Напрыклад, падчас пасяджэння школьнай рады настаўнік А. Якубецкі пратэставаў супраць вызвалення ад аплат за навучанне вучня Мікалая Трубіцына. Сваю думку педагог тлумачыў тым, што вучань "*вучыцца блага; захоўвае сябе ў гімназіі не так, як гэта патрэбна вучню старэйшай класы; бацька на вёсцы папом, сястра вучыцелькай у Дзвінскай беларускай урадавай гімназіі, і іх матэрыяльнае становішча куды лепшае, чым у большасці бацькоў нашых вучняў*"[1238].

З даступных крыніц вынікае, што адносіны паміж настаўнікамі і вучнямі складаліся добра. Разам з тым, здараліся і канфліктныя сітуацыі. На пасяджэнні 12 снежня 1928 г. Рада Беларускага школьнага аддзела разгледзела інцыдэнт вакол настаўніка У. Раткіна, які быў звольнены, але за яго заступіліся вучні (41 чал.). На думку рады, сітуацыя яскрава прадэманстравала хворыя бакі жыцця школы[1239]. 21 лістапада 1931 г. на разгляд школьнай рады яшчэ раз трапіла скарга групы вучняў на У. Раткіна, аўтары якой вінавацілі настаўніка ў суб'ектыўнасці падчас праверкі ведаў. Школьная рада палічыла такія паводзіны вучняў недапушчальнымі і вырашыла звярнуць на іх выхаванасць увагу бацькоў[1240]. Улетку 1931 г. міністэрства не працягнула кантракт з В. Зінкевічам, за якога хадайнічала школьная рада. 17 жніўня рада звярнулася ў БША з просьбай абараніць настаўніка, які працуе ў гімназіі ад пачатку і добра сябе зарэкамендаваў[1241].

У сувязі са школьнай рэформай у Латвіі кіраўніцтва гімназіі мусіла нанова вызначыць яе тып. На пасяджэнні Рады Беларускага школьнага

[1235] LVVA, 2067 f., 1 apr., 403 l., 120 lp.
[1236] LVVA, 2067 f., 1 apr., 403 l., 126 lp.
[1237] LVVA, 2067 f., 1 ap., 402 l., 22 lp.
[1238] LVVA, 2067 f., 1 ap., 376 l., 7 lp.
[1239] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 90–91 lpp.
[1240] LVVA, 2067 f., 1 ap., 377 l., 52–53 lpp.
[1241] LVVA, 2067 f., 1 ap., 377 l., 43 lp.

аддзела 5 чэрвеня 1928 г. адбылася дыскусія вакол гэтага пытання. Кастусь Езавітаў прапанаваў надаць школе 1-ю катэгорыю (гімназія з выкладаннем лацінскай мовы). Дзеяч лічыў, што лаціна ў гімназіі мусіць выкладацца, паколькі царскі ўрад свядома не даваў людзям вывучаць замежныя мовы, каб "загарадзіць ім доступ да вышэйшае школы". На яго думку павелічэнне гадзін выкладання замежных моў магло адбыцца коштам змяншэння гадзін Закону Божага: "*Беларусы павінны рыхтаваць інтэлігенцыю, якая змагла б працаваць вучыцялямі ў беларускіх сярэдніх школах, бо цяперака нам вучыцялёў не хапае і мы запрашаем з-за мяжы (...) Каб аблегчыць вучням навучанне добра было б звольніць вучняў ад лекцыяў рэлігіі, якія ў гімназіі лічацца неабавязковымі*"[1242]. Тым часам, Я. Шчорс лічыў патрэбным выбраць такі тып гімназіі, які стварае "*магчымасць паступіць у той тып вышэйшай школы, які дасць магчымасць беларускаму інтэлігенту з вышэйшай асветай атрымаць кавалак хлеба*"[1243]. На яго думку, такім патрабаванням адпавядаў 3-ці тып сярэдняй школы. Тым часам С. Сахараў, спаслаўшыся на меркаванне педрады гімназіі, выказаўся за 4-ы тып (з выкладаннем новых моў)[1244].

У галасаванні большасць сяброў Рады БША падтрымала прапанову К. Езавітава (супраць былі П. Жэрдзі і С. Сахараў, але апошні ўрэшце пагадзіўся на выкладанне лаціны)[1245]. У выніку была зацверджаная новая навучальная праграма гімназіі з падзелам на колькасць гадзін у тыдзень: беларуская мова (16 гадзін), латышская мова, лаціна, гісторыя і геаграфія, матэматыка (па 16 гадзін), нямецкая мова (12 гадзін), прыродазнаўства (7 гадзін), маляванне, чарчэнне і гісторыя малявання (7 гадзін), касмаграфія (2 гадзіны), фізіка (8 гадзін), усеагульная геаграфія і геаграфія Беларусі (4 гадзіны), усеагульная гісторыя і гісторыя Беларусі (13 гадзін), псіхалогія і логіка (3 гадзіны), гігіена (2 гадзіны), сельская гаспадарка (3 гадзіны), гімнастыка (2 гадзіны), практычныя заняткі гігіены (2 гадзіны), вайсковая падрыхтоўка (4 гадзіны), хімія (3 гадзіны), практычныя заняткі дэкламацыі (1 гадзіна), спевы і музыка (7 гадзін). Акрамя таго, былі прадугледжаныя два неабавязковыя прадметы – Закон Божы (5 гадзін) і руская мова (10 гадзін)[1246]. На прапанову Г. Цэльяда 17 ліпеня 1929 г. школьная рада ўхваліла рашэнне аб тым, каб у старэйшых класах (3-м і 4-м) замест лекцый па рэлігіі ўвесці этыку[1247]. У 1933 г. кіраўніцтва гімназіі адмовілася ад навучання лаціны,

---

[1242] LVVA, f. 2125, ap. 5, l. 4, 61–62 lpp.
[1243] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 61 lp.
[1244] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 61 lp.
[1245] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 74 lp.
[1246] LVVA, 2125 f., apr.5, 4 l., 61–62 lpp.
[1247] LVVA, 2067 f., 1 ap., 377 l., 8 lp.

замест якой было ўведзена выкладанне англійскай мовы і павялічана колькасць гадзін нямецкай мовы[1248].

Важнае месца ў навучальным працэсе па-ранейшаму займалі прадметы, якія надавалі гімназіі беларускі нацыянальны змест: беларуская мова і літаратура. На занятках па беларускай літаратуры вывучалі творы Якуба Коласа (*Сымон-музыка*, *Новая зямля*, *У палескай глушы*), Цішкі Гартнага, Алеся Гаруна, Францішка Аляхновіча (*Чорт і баба*, *Дзядзька Якуб*, *Птушка шчасця*, *Пан міністр*), Максіма Багдановіча, Міхася Зарэцкага, Змітрака Бядулі, Янкі Купалы (*Сон на кургане*, *Паўлінка*, *Адвечная песня*), Алеся Гурло, Францішка Багушэвіча, Уладзіслава Галубка (*Апошняе спатканне*), Яна Неслухоўскага, Міхася Чарота, Цёткі, Канстанцыі Буйло, Максіма Гарэцкага, Альберта Паўловіча (*Васількі*), Альгерда Абуховіча, Каруся Каганца, Ядвігіна Ш.[1249]

Навучальны працэс па-ранейшаму ўскладняла нястача падручнікаў і літаратуры на беларускай мове. 2 снежня 1926 г. дырэктар гімназіі С. Сахараў скардзіўся, што да яго звяртаюцца настаўнікі і наракаюць на адсутнасць падручнікаў. Ён прапанаваў БША наладзіць перасылку літаратуры з Вільні. Атрыманая ад віленчукоў прадукцыя, на яго думку, магла знаходзіцца на сталых складах у Даўгаўпілсе (у гімназіі) і Лудзы (у беларускай пачатковай школе). Ён адзначаў: "*Многія вучыцелі пачатковых школ звяртаюцца да мяне за беларускімі вучэбнікамі. Трэба была бы Аддзелу без затрымкі наладзіць зносіны з Віленскай беларускай кнігарняй, выпісаць адтуль неабходныя падручнікі і потым распрадзяліць іх па школах Люцынскага і Даўгаўпілскага паветаў. У Даўгаўпілсе і Люцыне зрабіць склады гэтых кніжок – у Даўгаўпілсе пры гімназіі, а ў Люцыне пры беларускай пачатковай школе. Пытанне гэтае вельмі паважнае, бо адсутнасць складоў беларускіх кніг вымагае ад вучыцялёў, асабліва маласвядомых нацыянальна, закупляць кніжкі на іншых мовах, а гэта даець магчымасць інспектарам пачатковых школ гутарыць аб ненацыянальным характары беларускіх школ і перадаваць іх у агульны дэпартамент*"[1250]. У лістападзе 1927 г. кіраўніцтва гімназіі прасіла Беларускі школьны аддзел дапамагчы ў атрыманні з Культурнага фонду Латвіі 600 латаў на падручнікі для найбяднейшых вучняў. У лісце чытаем: "*У гімназіі да 80% вучняў з'яўляюцца дзяцьмі незаможных бацькоў, якія з вялікім трудом знаходзяць сродкі дзеля ўтрымання сваіх дзетак і ні ў якім разе кожны з іх не можа купіць дзеля сябе неабходных падручнікаў, таму Школьная рада прызнала неабходным купіць хоць частку падручнікаў, каб на 4–5 вучняў быў бы хоць адзін гімназіяльны падручнік*"[1251]. Аднак у большасці выпадкаў гэтыя

[1248] *З Беларускага жыцьця за граніцай*, "Летапіс ТБШ" 1933, № 2, с. 40.

[1249] LVVA, 2067 f., 1 apr., 411 l., 45–47 lpp.

[1250] LVVA, 2067 f., 1 ap., 364 l., 200 lp.

[1251] LVVA, 2067 f., 1 ap., 364 l., 302 lp.

просьбы разбіваліся аб мур бюракратычнай сістэмы, якая не прадугледжвала дадатковых выдаткаў апрача тых, якія выдаткоўваліся школе на пачатку года[1252]. 23 лютага 1929 г. школьная рада гімназіі прыняла рашэнне частку атрыманых з бюджэту грошай прызначыць на падручнікі для найбяднейшых вучняў, якіх бацькі праз няўрод не былі ў стане набыць іх дзецям[1253].

Пачынаючы з 1925/26 гг. адбываліся спецыяльныя заняткі па гімнастыцы і пластыцы для дзяўчат[1254]. У гімназіі па-ранейшаму існавалі майстэрні для хлопцаў (сталярная, кавальская, працы па дрэве, механічная) і дзяўчат (ткацкая і шавецкая). Школа брала ўдзел у мясцовых і агульналатвійскіх выставах народнай творчасці, дэманструючы ўласныя вырабы і працы (напрыклад, малюнкі). 24–27 верасня 1926 г. у Даўгаўпілсе адбылася 5-я Латгальская гаспадарчая выстава, падчас якой была паказана дакументальная стужка *Латгалія ў жывых малюнках*. У падрыхтоўцы фільма ўдзельнічалі вучні беларускай гімназіі, якія выконвалі гімнастычныя практыкаванні, танчылі "Лявоніху" ў нацыянальных строях. Рукадзельная прадукцыя гімназіі атрымала дыплом 1 ступені, а сталярна-тэхнічныя вырабы – ганаровы дыплом. 28–29 траўня 1927 г., падчас святкавання 5-годдзя існавання гімназіі, вучні прадэманстравалі ўласныя вырабы: слясарня – ровар, замкі, атрамантавы прыбор, малаткі, вёдры; сталярня – дубовы буфет, пісьмовы стол, шафы, складаныя крэслы; ткацка-рукадзельная – вышыванкі, дываны і інш.[1255]

У мурах гімназіі быў створаны фатаграфічны гурток, які ўлетку ладзіў экскурсіі па вёсках і дакументаваў краявіды, народныя строі і будынкі. У 1926 г. школа набыла радыёпрымач, каб слухаць канцэрты з розных куткоў Еўропы[1256]. Гімназія дапамагала беларускай пачатковай школе ў Даўгаўпілсе. У чэрвені 1927 г. С. Сахараў адгукнуўся на просьбу школьнай рады пачатковай школы пазычыць піяніна на ўрачыстае ўручэнне атэстатаў сталасці першаму выпуску вучняў гэтай школы[1257]. Вось як у 1929 г. пісаў пра вучнёўскую самадзейную актыўнасць гімназіі кіраўнік БША: "*Беларуская гімназія ў мінулым годзе была адна ў Дзвінску і мела 78 вучняў. У гімназіі для вучняў маюцца добра абсталяваныя майстэрні (механічная, сталярная, ткацкая), якія за выстаўляныя на агульна-латгальскіх выстаўках экспанаты атрымліваюць*

[1252] LVVA, 2067 f., 1 ap., 364 l., 337 lp.

[1253] LVVA, 2067 f., 1 ap., 377 l., 4 lp.

[1254] *Гістарычны нарыс пяцігодзьдзя Дзьвінскай Дзяржаўнай Беларускай Гімназіі за 1922–1927 г.г.*, укл.: С. Сахараў, Дзьвінск 1927, с. 16–17.

[1255] *Сельска-гаспарадчая выстаўка ў м. Дзьвінску*, "Школьная праца" 1926, № 5; Е.Г. Андрэева, *Беларускі педагог у Латвіі*, "Народная асвета" 2000, № 9, с. 157; *Гістарычны нарыс пяцігодзьдзя Дзьвінскай Дзяржаўнай Беларускай Гімназіі за 1922–1927 г.г.*, укл.: С. Сахараў, Дзьвінск 1927, с. 17–22.

[1256] *Беларускае жыцьцё*, "Голас беларуса" 1925, № 3 ад 1 ліпеня, с. 3.

[1257] LVVA, 2067 f., 1 ap., 364 l., 267 lp.

дыпломы I ці II ступені. Гімназія мае добры вучнёўскі хор, які выконваннем беларускіх спеваў на агульналатгальскіх святах заўсёды атрымлівае найлепшыя прызнанні ў усёй латышскай прэсы"[1258]. 30–31 траўня 1931 г. у гімназіі адбылася выстава вырабаў вучнёўскай майстэрні, а таксама латарэя падчас якой прадаваліся выставачныя рэчы[1259].

Кіраўніцтва гімназіі рупілася пра захаванне ў школьных мурах належнай гігіены і санітарыі. У школе працаваў штатны лекар. На тэрыторыі ўстановы вучні знаходзіліся ў непараўнальна лепшых санітарных умовах за тыя, што панавалі ў вясковых хатах[1260].

Гімназія па-ранейшаму знаходзілася ў будынку па адрасе: вуліца Варшаўская, 16. Вось як стан будынка апісвала газета "Голас беларуса": "*Абарудавана гімназія дужа добра: мае добрае памешканне, светлыя вялікія класныя пакоі, вельмі добрую і вялікую актавую залу са сцэнай, на якой ставяцца школьныя спектаклі; мае тры майстэрні: механічна-сталярную, сляcарна-такарную і ткацка-швейную*"[1261]. Нагадаем, што будынак не з'яўляўся яе ўласнасцю, а быў арандаваны ў прыватнай асобы. Кіраўнік гімназіі 26 чэрвеня 1930 г. інфармаваў Беларускі школьны аддзел пра заканчэнне арэнды. Уласніца Шэйна Брудная пагадзілася працягнуць арэнду на тры гады пры ўмове, што аплата будзе вышэйшая на 40 латаў штомесяц, а кіраўніцтва школы адрамантуе будынак. У выпадку адмовы яна была гатова заключыць новую дамову толькі на год. Кіраўніцтва лічыла патрабаванні празмернымі, таму падало на гаспадыню ў суд[1262].

Галоўнай крыніцай утрымання гімназіі былі сродкі з дзяржаўнага бюджэту, якія паступалі праз Беларускі школьны аддзел. Аднак на паўнавартае функцыянаванне школы тых грошай не хапала. Педагогі мусілі шукаць дадатковых крыніц фінансавання. У 1926 г. педрада гімназіі выдала адозву *Да беларускага вучыцельства Даўгаўпілскага і Лудзенскага павету і м. Рыгі*, у якім заклікала ўсімі сродкамі падтрымаць школу[1263]. Аднак незаможная беларуская грамадскасць не была ў стане даць належнай дапамогі. Адной з крыніцаў прыбытку былі латарэі і дабрачынныя вечарыны. Дзякуючы праведзенай у лістападзе 1926 г. латарэі ў Старой Слабадзе і Лаўдараве гімназія зарабіла 1 289 рублёў, з якіх 289 склаў заробак арганізатара У. Ціхамірава[1264].

[1258] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 2 lp.

[1259] *Хроніка*, "Думка беларуса" 1931, № 1, с. 3.

[1260] LVVA, 2067 f., 1 ap., 378 l., 70 lp.

[1261] *Адчынены прыём вучняў у Дзьвінскую Беларускую Дзярж. Гімназію на 1926–27 вуч.г.*, "Голас беларуса" 1926, № 12 ад 14 ліпеня, с. 1.

[1262] LVVA, 2125 f., 5 ap., 235 l., 43 lp.

[1263] *Да беларускага вучыцельства Дзьвінскага і Люцынскага павету і м. Рыгі*, "Школьнае жыццё" 1926, № 2, с. 23.

[1264] LVVA, 2067 f., 1 ap., 376 l., 1 lp.

У 1925/26 гг. такім чынам гімназія зарабіла каля 2 тыс. латаў. Прыбытак ішоў на падтрымку найбяднейшых вучняў. Праўда, некаторыя педагогі выступалі супраць таго, каб вучні ўдзельнічалі ў мерапрыемствах, якія прыносілі гімназіі грошы. Пра тое, што дзяцей трэба прыцягваць толькі да літаратурных вечарын, казаў на бацькоўскім сходзе 24 кастрычніка 1930 г. У. Райко[1265].

Каб зарабіць, гімназія здавала залу іншым арганізацыям – як беларускім, так і не[1266]. Напрыклад, 6 сакавіка 1927 г. У зале прайшла ўкраінская вечарына з удзелам украінскіх артыстаў, якія атрымалі палову прыбытку[1267]. 13 сакавіка 1927 г. школьная рада дазволіла 8-му Даўгаўпілскаму рускаму атраду гайдаў зладзіць у будынку гімназіі мерапрыемства[1268]. 29 красавіка 1933 г. Даўгаўпілскі аддзел ТБНЛ правёў у мурах гімназіі вечарыну з спектаклямі *Выбары старшыні* і *Суд над трохпалёўкай*[1269]. Выручка пайшла на выданне часопіса "Беларуская школа ў Латвіі". Даўгаўпілскі аддзел таварыства "Беларуская хата" прасіў гімназію даць памяшканне на 10 лютага 1934 г., каб паказаць спектакль паводле п'есы Ф. Аляхновіча *Шчаслівы муж*[1270].

Варта больш уважліва прааналізаваць прыбыткі і выдаткі гімназіі. У 1928/29 гг. гімназія атрымала 1 348 латаў прыбытку, які складаўся з: выручкі ад вечарын – 448 латаў, латарэй – 360, арэнды гімназічнай залы – 300, арэнды гімназічнага памяшкання – 132, арэнды сельскагаспадарчых прылад – 10, кампенсацыі аплат за навучанне – 10, ахвяраванняў – 74, іншых крыніц – 13. Тым часам выдаткі склалі 1 192 латы, у тым ліку: вызваленне вучняў ад аплат – 983, атрамант для вучняў – 15, падатак за зямлю – 8, дастаўка матэрыялаў на будоўлю на зямлі гімназіі – 100, рэшта пайшла на заробак вартаўніка, дэталі для радыёпрыймача, запазычанасць перад мясцовай друкарняй[1271]. У 1929/30 гг. прыбытак гімназіі склаў 1 178 латаў, з іх 513 – прыбытак ад вечарын, 100 – стыпендыі, 19 – ахвяраванні, 15 – каменсацыя аплат за навучанне, 200 – арэнда зямельнага надзела, 68 – арэнда памяшкання, 263 – прыбытак з мінулых гадоў. Выдаткі склалі 1 171 лат, з іх 992 – вызваленне вучняў ад аплаты за навучанне і судовыя выдаткі ў справе супраць Ш. Бруднай. Рэшта грошай была вытрачаная на рамонт, падаткі і дробныя выдаткі[1272].

[1265] LVVA, 2067 f., 1 ap., 377 l., 33–34 lp.
[1266] LVVA, 2067 f., 1 ap., 376 l., 1 lp.
[1267] LVVA, 2067 f., 1 ap., 376 l., 9, 11 lpp.
[1268] LVVA, 2067 f., 1 ap., 376 l., 30 lp.
[1269] LVVA, 2067 f., 1 ap., 365 l., 194 lp.
[1270] LVVA, 2067 f., 1 ap., 365 l., 260 lp.
[1271] LVVA, 2067 f., 1 ap., 377 l., 14 lp.
[1272] LVVA, 2067 f., 1 ap., 377 l., 29–30 lpp.

На пачатку 1930-х гг. у гімназіі з'явілася яшчэ адна істотная крыніца прыбытку: выручка ад арэнды зямельнага надзела. У лютым 1933 г. зямля была здадзеная ў арэнду Янісу Гінтарсу[1273].

На патрэбы вучняў, якія жылі далёка ад Даўгаўпілса, працягваў дзейнічаць інтэрнат. Ён быў заўсёды перапоўнены (у 1925/26 гг. у ім знаходзіліся 34 вучні)[1274]. У інтэрнаце існавала пасада гаспадыні, яе абавязкам было гатаваць вучням гарбату і абеды, глядзець за чысцінёй у калідоры і ў пакоях[1275]. Матэрыяльнае становішча інтэрната было настолькі складаным, што ў студзені 1925 г. ён быў часова зачынены, а найбяднейшыя вучні атрымалі грашовую дапамогу на арэнду кватэр. Толькі ў 1925/26 гг. у каштарысе гімназіі з'явіліся асобныя сродкі на ўтрыманне інтэрната. Было нанятае новае памяшканне на вуліцы Лагернай (г. зв. будынак Мяккага), якое складалася з двух 5-пакаёвых кватэр. У інтэрнат прынялі адразу 42 вучняў. У 1926 г. быў наняты новы 2-павярховы будынак на вуліцы Зялёнадарожнай, 24 (будынак Ліфшыца), у якім былі занятыя тры кватэры з 15 пакоямі. Новае памяшканне дазволіла вучням рассяліцца вальней і не перашкаджаць адзін адному ў падрыхтоўцы да заняткаў. У інтэрнаце жыў таксама справавод І. Фёдараў. Інтэрнат меў чытальню з прэсай, дзе ладзіліся гульні і вечарыны. Вострым пытаннем была адсутнасць харчавання для жыхароў інтэрната, паколькі большасць вучняў не мелі грошай на танныя абеды[1276].

Утрыманне інтэрната было дадатковым фінансавым цяжарам для гімназіі. Беларускі актыў быў вымушаны шукаць дадатковых субсідый. У лісце Я. Райнісу (кастрычнік 1925 г.) С. Сахараў пісаў: "*Лічу неабходным нагадаць Вам, што становішча дзяцей, якія жывуць у інтэрнаце, сапраўды бядотнае: некаторыя харчуюцца адным толькі чорным хлебам і п'юць кіпень з сахарынам. Адарваныя ад сям'і дзеці ніякай дапамогі не могуць адтуль атрымаць як па беднасці бацькоў, так і па прычыне далёкай адлегласці. Прасілі дапамогі ў Міністэрства, якое, зачыніўшы Лудзенскую беларускую гімназію, маральна і юрыдычна абавязана прыйсці на дапамогу ні ў чым не вінаватым дзецям, але гэтай дапамогі няма да гэтага часу. Адзіная надзея засталася на Вас, хто прымае блізкі ўдзел у справах беларускай нацыянальнай меншасці. Можа быць, Вы, карыстаючыся сваім аўтарытэтам, або ў прыватных дабрачынных установах, або ў Жаночым корпусе, або ў Культурным фондзе зможаце атрымаць хоць бы невялікую субсідыю для нашых бедных навучэнцаў і тым самым палегчыць іх гаротную долю. Мы, педагогі, усялякімі шляхамі шукаем*

[1273] LVVA, 2067 f., 1 ap., 378 l., 23 lp.

[1274] LVVA, 2067 f., 1 ap., 387 l., 28 lp.

[1275] LVVA, 2067 f., 1 ap., 387 l., 103 lp.

[1276] *Гістарычны нарыс пяцігодзьдзя Дзьвінскай Дзяржаўнай Беларускай Гімназіі за 1922–1927 г.г.*, укл.: С. Сахараў, Дзьвінск 1927, с. 23–26.

сродкі, але іх не заўсёды хапае"[1277]. Тым часам К. Езавітаў апеляваў да беларускай грамадскасці за мяжой, каб дапамагалі знайсці грошы на ўтрыманне інтэрната пры гімназіі[1278]. З лістапада 1925 г. дзеяч падрыхтаваў адозву да беларусаў па-за межамі Латвіі заклікаючы дапамагчы грашыма пракарміць вучняў, якія жылі ў інтэрнаце. У дакуменце адзначалася, што ўтрыманне 40 вучняў патрабуе 40 тыс. латвійскіх рублёў штомесяц. Аўтар сцвярджаў, што спачатку неабходна атрымаць 300–400 даляраў, што дазволіць забяспечыць моладзь на некалькі месяцаў. Ён падкрэсліваў, што вучні з Даўгаўпілшчыны атрымліваюць пасылкі з вёскі, тым часам іх сябры з Лудзеншчыны жывуць "упрогаладзь". Іншыя, не маючы магчымасці пратрымацца ў Даўгаўпілсе пасля закрыцця Лудзенскай гімназіі, вымушаны былі ісці ў латышскія школы[1279].

Захаваліся ўспаміны пра вучнёўскае жыццё ў інтэрнаце. 7 снежня 1927 г. бацька аднаго з вучняў, Ігнат Кэраль са Скайсценскай воласці, звярнуўся з заявай да кіраўніцтва гімназіі, адзначаючы, што да яго дайшлі скаргі сына на гаспадыню інтэрната, якая "*крадзе вучням харчы, ужывае непадходныя для жанчыны словы, гутарыць з вучнямі толькі на расейскай мове і іншае*"[1280]. Бацька прасіў палепшыць атмасферу ў інтэрнаце. Школьная рада гімназіі вырашыла, што апекай над жыхарамі інтэрната павінен займацца настаўнік (выхавальнік), як гэта было падчас настаўніцкіх курсаў. Кіраўніцтва гімназіі бачыла на гэтай пасадзе Ю. Пантэвічса. Педрада прасіла, каб БША залічыла выхавальніку працу ў інтэрнаце як урокі (12 гадзін) у школе[1281].

Доўгая адсутнасць выхавальніка ўплывала на дысцыпліну ў інтэрнаце. 19 кастрычніка 1927 г. справавод гімназіі І. Фёдараў западозрыў, што вучань Мікола Панькоў крадзе ў іншых вучняў кнігі[1282]. Вучань Міхась Альшэўскі таксама краў кніжкі ў сяброў[1283]. 21 верасня 1928 г. на Радзе БША дырэктар гімназіі С. Сахараў патлумачыў прысутным, што крыніцай праблем з'яўляецца нявырашанае пытанне з выхавальнікам у інтэрнаце. Прысутныя вырашылі прапанаваць пасаду апекуна інтэрната К. Езавітаву. Апошні, аднак, адмовіўся, спасылаючыся на асабістыя прычыны і параіў скіраваць у Даўгаўпілс М. Дзямідава альбо пашукаць кандыдата за мяжой. Адначасова ён адзначыў, што інтэрнат патрабуе строгага рэжыму. У рэшце рэшт выхавальнікам стаў У. Відаўскі (да верасня 1932 г.), а пасля яго М. Фёдарава[1284].

[1277] Цыт. за: С. Папар, *У зялёным садзе вятры гудзелі. Да 100-годдзя з дня нараджэння Сяргея Сахарава*, "Голас Радзімы" 1980, № 42, с. 6.

[1278] LVVA, 3235 f., 6 ap., 196 l., 167 lp.

[1279] LVVA, f. 3235, apr. 6, l. 196, 167 lp.

[1280] LVVA, 2067 f., 1 ap., 387 l., 49 lp.

[1281] LVVA, 2067 f., 1 ap., 387 l., 61 lp.

[1282] LVVA, 2067 f., 1 ap., 387 l., 48 lp.

[1283] LVVA, 2067 f., 1 apr., 403 l., 110 lp.

[1284] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 77 lp.

Вучні ў інтэрнаце сталаваліся (снеданні і абеды), але як многія бацькі не мелі грошай, дык большасць ела "ўсухамятку" спажываючы тое, што прывезлі з хаты: сала, хлеб, масла і г.д. На думку кіраўніцтва гімназіі, гэта адмоўна адбівалася на здароўі вучняў. Школьная рада гімназіі пастанавіла ўвесці абавязковае сталаванне паводле наступнага прынцыпу: "*Кожны бацька вучня, жывучага ў інтэрнаце, павінен за поўнае сталаванне – снеданне, абед і вячэру свайго сына ці дачкі ўнесці гімназіі грашыма – 15 лат ці на гэтую суму прыслаць прадуктаў, якія будуць прымацца гімназіяй па рыначнай каштоўнасці*"[1285]. На практыцы пастанова не выконвалася праз беднасці бацькоў. У сувязі з гэтым кіраўніцтва гімназіі было вымушана зноў прасіць Беларускі школьны аддзел выдаткаваць сумы на ўтрыманне інтэрната. У звароце чытаем: "*У мінулым месяцы ні было дані ні сантыма, а выдаткі ёсць вялікія, не хапае ложак, няма саломы, электрычных лямпаў і розныя мелкія рэчы акрамя таго неабходна заплаціць арэнду за два месяцы*"[1286]. У сувязі з пагаршэннем фінансавай сітуацыі гімназіі 17 жніўня 1931 г. школьная рада вырашыла звярнуцца ў БША з просьбай уключыць у каштарыс установы на 1931/32 гг. дадатковыя выдаткі на выхавальніка інтэрната[1287].

У гімназіі кіпела культурнае жыццё. Асновы нацыянальна-патрыятычнага выхавання заклаў яшчэ І. Краскоўскі. Культурная праца не спынілася пасля яго сыходу. Ладзіліся вечарыны з нагоды нацыянальных свят і юбілеяў. У 1925 г. у гімназіі адзначылі 400-годдзе беларускага друку, ушанаваўшы памяць Францішка Скарыны[1288]. 30 лістапада 1925 г. у мурах школы адбылася вечарына прысвечаная 20-годдзю творчай працы Якуба Коласа[1289]. У тым жа годзе настаўнікі і вучні адзначылі 25-годдзе смерці Францішка Багушэвіча[1290]. Істотнай падзеяй было святкаванне 19 верасня 1926 г. 20-годдзя беларускага друку. 10 жніўня 1926 г. Рада БША стварыла камісію па распрацоўцы плану святкавання 5-годдзя існавання беларускай школы ў Латвіі ў складзе: Р. Плыгаўкі, Я. Шчорса, М. Дзямідава і К. Езавітава[1291]. Мерапрыемства адбылося 26 верасня 1926 г.[1292] Узнёсла гучаць словы выхаванца гімназіі – аўтара часопіса "Школьная праца": "*Пяць гадоў прайшло з пачатку беларускай культурна-прасветнай працы ў Латвіі, г.зн. з пачатку, калі пачалі закладацца*

[1285] LVVA, 2067 f., 1 ap., 387 l., 77 lp.

[1286] LVVA, 2067 f., 1 ap., 387 l., 115 lp.

[1287] LVVA, 2067 f., 1 ap., 387 l., 89 lp.; LVVA, 2067 f., 1 ap., 377 l., 44 lp.

[1288] *Беларускае жыцьцё*, "Голас беларуса" 1925, № 3 ад 1 ліпеня, с. 3.

[1289] LVVA, 2067 f., 1 ap., 375 l., 42 lp.

[1290] *Гістарычны нарыс пяцігодзьдзя Дзьвінскай Дзяржаўнай Беларускай Гімназіі за 1922–1927 г.г.*, укл.: С. Сахараў, Дзьвінск 1927, с. 38.

[1291] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 31 lp.

[1292] *Сьвяткаваньне 5-ці гадовага юбілея беларус. школы ў Латвіі*, "Школьная праца" 1926, № 5.

сярод беларускага жыхарства светлыя нацыянальныя аганькі – школы, як беларускія дзеткі пачулі ў школцы сваю родную мову, пачулі апавяданні аб сваім родным краі, сваім родным народзе, а яго многапакутнай гісторыі..! як пасля доўгага сну прабудзілась наша беларуская моладзь і казала: 'Што-ж гэта беларус такі самы чалавек, як і ўсе, яго мова нікольк не хужэй другіх моў, а нават прыгажэй; ён мае сваіх магутных пісьменнікаў, слаўнае, хоць і цяжкае, мінулае, а таму павінен мець і лепшую будучыню'"[1293].

Вучні і настаўнікі ўдзельнічалі ў днях беларускай культуры. Напрыклад, 25–26 траўня 1929 г. у Даўгаўпілсе гімназісты разам з вучнямі мясцовай беларускай пачатковай школы ўзялі ўдзел у Днях беларускай культуры, зладзіўшы выставу вучнёўскіх прац, а таксама "Куток беларускага друку" з больш як 300 беларускімі кнігамі[1294].

28–29 траўня 1927 г. гімназія адзначыла 5-годдзе існавання. У межах святкавання была зладжаная выстава вучнёўскіх вырабаў – сталярных, слясарных, рукадзельных, а таксама мастацкіх твораў[1295]. Вучні паставілі п'есу Вольгі Сахаравай *Зачараваная кніжка* і інсцэніроўку *Сон на кургане* паводле Янкі Купалы. Выступіў хор, балетная група і струнны аркестр (кіраўнік У. Ціхаміраў). Імпрэза завяршылася танцамі, якія скончыліся ажно а 4 раніцы. Пра высокі ранг урачыстасці сведчаць колькасць удзельнікаў і іх статус: кіраўнік БША У. Пігулеўскі, мэр Даўгаўпілса І. Волант, інспектар пачатковых школ Даўгаўпілшчыны, старшыня Даўгаўпілскага латышскага культурнага таварыства, больш як 100 беларускіх вучняў і настаўнікаў беларускіх пачатковых школ, беларускія дзеячы Латвіі (К. Езавітаў – ад ТБНЛ, М. Дзямідаў – ад таварыства "Беларуская хата", настаўніцкіх курсаў і школьнай рады 2-й Рыжскай школы, Я. Шчорс – ад таварыства "Рунь", К. Мяжэцкі – ад Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў, Н. Пінская – ад Беларускага тэатральнага таварыства ў Латвіі, А. Барткевіч – ад выпускнікоў гімназіі), Канстанцін Кулееў – ад Даўгаўпілскай рускай гімназіі. Ад імя вучняў прысутных павіталі Надзея Мікалаева і Мечыслаў Слосман, яны прачыталі свае вершы, прысвечаныя гімназіі. Віншаванні даслаў міністр асветы Я. Райніс, прадстаўнікі і арганізацыі беларусаў з-за мяжы: дырэктар Інбелкульту У. Ігнатоўскі, праф. Б. Эпімах-Шыпіла, А. Луцкевіч, К. Дуж-Душэўскі, кіраўніцтва БНК у Празе, Галоўная ўправа Таварыства беларускай школы, кіраўніцтва Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры, Беларуская хрысціянская дэмакратыя, Беларускі студэнцкі саюз, віленскі БНК, педрада Віленскай беларускай гімназіі, кіраўнікі Віленскай, Радашковіцкай

[1293] Матурыст, *Пяць гадоў... (1921–1926),* "Школьная праца" 1926, № 5.

[1294] *Хроніка*, "Школьная праца" 1929, № 13.

[1295] LVVA, 2067 f., 1 ap., 364 l., 158 lp.; LVVA, 2067 f., 1 ap., 435 l., 12 lp.; LVVA, 6845 f., 2 ap., 13 l., 1 lp.

(Язэп Гаўрылік) і Клецкай гімназій, былыя настаўнікі гімназіі І. Краскоўскі і П. Мядзёлка-Грыб і г.д.[1296]

Варта прывесці вытрымкі з некаторых тэлеграм, якія гімназія атрымала з-за мяжы. У віншаванні кіраўніцтва БНК у Празе чытаем: "*БНК шле шчырае прывітанне для Беларускай дзяржаўнай гімназіі ў Дзвінску з аказіі пятых угодкаў ейнага залажэння. Поўная добрая школа ёсць кузняй на выхоўванне маладых, свежых байцоў за Волю, Праўду і Славу для свайго народа. Шчыра жадае, каб і Дзвінская беларуская гімназія ў наступным новым пяцігоддзі свайго існавання дала нашаму Народу беларускаму новых апосталаў ягонага вызвалення*"[1297]. Тым часам А. Луцкевіч (29 траўня 1927 г.) пісаў на адрас гімназіі: "*Вы – кузня, дзе куюцца і гартуюцца душы будучых беларускіх інтэлігентаў. Працуючы ў адным кутку нашае Бацькаўшчыны, Вы робіце вялікую справу дзеля ўсяго Беларускага Народа, бо ж ніякія межы не змогуць разбіць духовага адзінства ўсіх беларусаў. Хай жа развіваецца і працвітае Даўгаўпілская дзяржаўная беларуская гімназія – плод супрацоўніцтва беларусаў і братняга Латвійскага народа, у дзяржаве якога Вы апынуліся. Хай сее 'разумнае, добрае, вечнае' ў душы будучых барацьбітоў за святыя правы працоўнае Беларусі, хай прыложаць руку да тварэння беларускае культуры. Слава тварцом гімназіі, слава настаўнікам, слава гадунцом яе!*"[1298]. У тэлеграме кіраўніцтва ТБШ адзначалася: "*Галоўная Управа Таварыства Беларускае Школы горача вітае Гімназію з днём пятых угодкаў яе існавання і жадае далейшага развіцця і карыснае працы на ўзгадаванне маладых і стойкіх змагароў за правы нашага народа і яго культуры. Галоўная Управа з тым большай радасцяй вітае слаўныя ўгодкі культурнае пляцоўкі ў Латвіі, што сама няўпынна змагаючыся за правы роднае школы ў Заходняй Беларусі – у добрым развіцці сярэдняе беларускае школы ў другіх гаспадарствах, бачыць залог таго, што беларуская сярэдняя школа ў сваім развіцці йдзе наперад і што яе імкненні да падойму культуры не спыняць ніякія перашкоды*"[1299].

Заслугоўваюць увагі словы латвійскіх беларусаў, якія далучыліся да віншаванняў. Прадстаўнік Лудзенскай беларускай пачатковай школы С. Казека

[1296] *5-ці гадовы юбілей Дзьвінскай дзяржаўнай беларускай гімназіі*, "Школьная праца" 1927, № 8–9, с. 15.

[1297] LVVA, 2067 f., 1 ap., 435 l., 22 lp.

[1298] LVVA, 2067 f., 1 ap., 435 l., 35 lp.; Е.Г. Андрэева, *Беларускі педагог у Латвіі*, "Народная асвета" 2000, № 9, с. 158; Яна ж, *Сяргей Пятровіч Сахараў – вядомы педагог, этнограф і фалькларыст* [у:] *Беларускае Асветніцтва: вопыт тысячагоддзя: Матэрыялы II Міжнар. Канг.*, рэд. А. Лугоўскі і інш, Менск 2001, с. 4–8; *Гістарычны нарыс пяцігодзьдзя Дзьвінскай Дзяржаўнай Беларускай Гімназіі за 1922–1927 г.г.*, укл.: С. Сахараў, Дзьвінск 1927, с. 47–48.

[1299] *Гістарычны нарыс пяцігодзьдзя Дзьвінскай Дзяржаўнай Беларускай Гімназіі за 1922–1927 г.г.*, укл.: С. Сахараў, Дзьвінск 1927, с. 44–45.

пісаў: "*Ад імя Люцынскае беларускае пачат.[ковае] школы шчыра вітаю Дзвінскую дзяржаўную беларускую гімназію з 5-ці гадовым юбілеем яе існавання. Ад чыстага сэрца жадаю ёй усяго найлепшага ў будучыні. Хай моцна яна праводзіць тую ідэю, якую мелі яе закладчыкі пяць год таму назад пры яе арганізацыі. Хай яе настаўнікі самаахвярна і шчыра праводзяць у жыццё гэтыя ідэі. Хай яе выхаванцы будуць тымі, што панясуць у маласвядомы сваёй нацыянальнасці цёмны люд беларускі народ разам з ідэямі праўды, дабра і справядлівасці каханне свайго народа і жаданне яму лепшае, светлае будучыні. Хай жыве і мацуецца Дзвінская дзяржаўная беларуская гімназія на славу беларусам і на карысць Латвійскай дзяржавы. Некаторыя прычыны не дазволілі мне прыехаць на гэтае свята і затрымалі вучняў нашае школы, што меліся далучыцца да сабранае грамады і парадавацца Вашым святам. Але верце, што целам мы далёка, але думкамі ў гэты час мы разам з Вамі. Усім прысутным на свяце шлю шчырае прывітанне і пажаданне ўсяго найлепшага*"[1300]. А вось што пісаў кіраўнік гімназіі-юбіляркі С. Сахараў: "*Мы пэўны ў тым, што пры падтрымцы Латвійскага Народа і яго Урада і пры любоўным адношанні беларускай нацыянальнай меншасці да сваёй роднай гімназіі, яна з поспехам будзе служыць і на далейшы час святым ідэалам беларускага нацыянальна-культурнага адраджэння*"[1301].

У наступныя гады культурная праца ў гімназіі не спынілася. Варта прывесці найбольш яскравыя прыклады. У 1930 г. у гімназіі святкавалі 400-годдзе Літоўскай Метрыкі. Падчас імпрэзы прамаўляў дырэктар С. Сахараў, а таксама адбылася пастаноўка п'есы В. Сахаравай *Птушка на волі*. З нагоды свята вучні намалявалі партрэт Льва Сапегі, а ў калідоры была зладжаная выстава з выявай Статута ВКЛ[1302]. 5 кастрычніка 1930 г. намаганнямі настаўнікаў і вучняў была зладжаная вечарына прысвечаная 25-годдзю творчай працы Я. Купалы. На ўрачыстасці выступіў С. Сахараў, а вучань 5-га класа Алесь Казачонак прачытаў рэферат пра песняра[1303]. 6 снежня 1931 г. у мурах гімназіі адзначалася 10-годдзе беларускай нацыянальнай працы ў Латвіі[1304], 29 кастрычніка 1932 г. – 50-годдзе Янкі Купалы і Якуба Коласа. Кастусь Езавітаў прачытаў лекцыю *Янка Купала і Якуб Колас у беларускім адраджэнскім руху*[1305]. У снежні 1932 г. настаўнікі і вучні Даўгаўпілскай беларускай

[1300] LVVA, 2067 f., 1 ap., 435 l., 32 lp.

[1301] *Гістарычны нарыс пяцігодзьдзя Дзьвінскай Дзяржаўнай Беларускай Гімназіі за 1922–1927 г.г.*, укл.: С. Сахараў, Дзьвінск 1927, с. 48.

[1302] LCVA, f. 368, ap. 1., b. 33, l. 281.

[1303] *25-гадовы юбілей літэратурнай працы Янкі Купалы*, "Шлях праўды" 1930, № ад 24 кастрычніка, с. 3.

[1304] LVVA, 2067 f., 1 ap., 377 l., 49 lp.

[1305] LVVA, 2125 f., 5 ap., 255 l., 117 lp.

гімназіі зноў адзначылі юбілей Я. Коласа, паставіўшы п'есу *У палескай глушы* (пад кіраўніцтвам А. Якубецкага)[1306].

У гімназіі працягваў дзейнічаць драматычны гурток. Пасля сыходу П. Мядзёлкі-Грыб ім кіраваў П. Жэрдзі. Нават падчас беларускага працэсу вучнёўскія калектывы не спынілі працы, паставіўшы такія спектаклі, як *Дзядзька Якуб*, *Страхі жыцця* і інш. Пазней вучні паказвалі і іншыя п'есы Ф. Аляхновіча: *Міхалка*, *Пан міністр*, *Птушка шчасьця*, К. Каганца *Модны шляхцюк*, Я. Купалы *Паўлінка*, В. Дуніна-Марцінкевіча *Пінская шляхта* і інш. 26 снежня 1926 г. у Даўгаўпілскай беларускай гімназіі прайшла вечарына з пастаноўкай камедыі-фарса *Я памёр*, камедыі *Модны шляхцюк* (К. Каганец), спеваў і танцаў[1307]. Акрамя таго ў гімназіі ставілі п'есы мясцовай пісьменніцы Вольгі Сахаравай – *На Полацкім замчышчы* і *Птушка на волі*. Прэм'ера першай адбылася ў 1927 г., а праз год яна была выдадзена асобнай кніжкай і ставілася школьнымі тэатрамі. У даўгаўпілскай гімназіі ставілі і іншыя п'есы В. Сахаравай – *Маладыя пабегі*, *Ліст да Прэзідэнта*, *Аксюткіна ёлка*[1308]. Нярэдка тэатральныя выступы суправаджаліся публічнымі лекцыямі. Падчас адной з іх у прысутнасці 80 слухачоў настаўнік У. Раткін прачытаў лекцыю, пасля чаго вучні паставілі п'есу *Міхалка*[1309]. Вучні ставілі спектаклі не толькі ў сваёй школе, але таксама выязджалі ў вёскі (напрыклад, падчас калядных свят). Грошы, зароблены падчас выступаў, ішлі ў скарбонку гімназіі, на патрэбы найбяднейшых вучняў[1310].

На працягу 1925–1927 гг. вучні зладзілі каля 20 тэатральных і музычных выступаў у Даўгаўпілсе і ў правінцыі. Акрамя пералічаных раней твораў, яны гралі п'есы Ф. Аляхновіча *На вёсцы*, *Заручыны Паўлінкі*, В. Сахаравай *Зачараваная княжна* (паводле твора Я. Купалы *Сон на кургане*), Н. Мясніцкага *Я памёр*, М. Гогаля *Ночь перед Рождеством* і *Запорожец за Дунаем* і інш.[1311] Вучнёўская тэатральная трупа працягвала дзейнічаць і ў пазнейшыя гады. 19 студзеня 1929 г. вучні паставілі ў гарадскім клубе п'есу *Паўлінка*[1312].

Вучнёўскі хор браў удзел у штогадовым латгальскім свяце спевакоў разам з хорамі іншых нацыянальнасцяў: латышскім, рускім, польскім, габрэйскім. Напрыклад, 2 чэрвеня 1929 г. у латгальскім свяце спевакоў узяў удзел

[1306] Прытымбытны, *Сьвяткаваньне 50-ых угодк. Якуба Коласа у Дзьвінску*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 1(18), с. 266.

[1307] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 112, л. 8.

[1308] *Белорусский след в латвийской истории: биографический справочник*, Минск 2019, с. 87–88.

[1309] *Хроніка беларускага жыцьця у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 5(22), с. 336.

[1310] LCVA, f. 368, ap. 1., b. 33, l. 281.

[1311] *Гістарычны нарыс пяцігодзьдзя Дзьвінскай Дзяржаўнай Беларускай Гімназіі за 1922–1927 г.г.*, укл.: С. Сахараў, Дзьвінск 1927, с. 37.

[1312] LVVA, 2067 f., 1 ap., 377 l., 1 lp.

беларускі хор з 70 чал. пад кіраўніцтвам настаўніка спеваў А. Фрэйманіса. Хор складаўся з вучняў гімназіі і курсантаў рыжскіх настаўніцкіх курсаў, а таксама аматараў спеву. Беларусы заспявалі беларускія песні, у тым ліку *Мы выйдзем шчыльнымі радамі* Макара Краўцова[1313]. Хор гімназіі выступіў таксама падчас імпрэзы ўкраінскай драматычнай трупы пад кіраўніцтвам В. Гайданава, якая паказала спектаклі паводле ўкраінскіх п'ес у Даўгаўпілсе[1314]. Беларуская моладзь гастралявала і за межамі Латвіі. 26 траўня 1932 г. хор гімназіі разам з хорам Даўгаўпілскай латышскай гімназіі ўдзельнічаў у канцэртах у Зарасай (Літва)[1315].

Пад кіраўніцтвам С. Сахарава вучні ладзілі рэгулярныя фальклорныя экспедыцыі па вёсках Латгаліі. Сабраныя прадметы матэрыяльнай культуры захоўваліся ў этнаграфічна-гістарычным музеі гімназіі, створаным з ініцыятывы С. Сахарава і зацверджаным школьнай радай 13 верасня 1927 г.[1316] Запісы народных песень і казак друкаваліся на старонках гімназічнай прэсы. Збіралі фальклор і настаўнікі, і вучні – Я. Клагіш, М. Талерка, Г. Нікіфароўская, В. Казлоўская і інш. На працягу 1927–1930 гг. яны запісалі больш як 600 песняў, 70 апавяданняў, шмат прымавак і прыказак. Гімназія звярталася ў Культурны фонд Латвіі і Аддзел па ахове помнікаў мінуўшчыны Міністэрства асветы з просьбай прафінансаваць выданне гэтых матэрыялаў[1317]. У лютым 1930 г. Даўгаўпілскі аддзел ТБНЛ звярнуўся да інспектара беларускіх школ з прапановай "*Прасіць Беларускі Аддзел звярнуцца ў Думу Культурнага фонда аб асігнаванні 1000 лат на друкаванне ўжо сабранага этнаграфічнага матэрыялу (Дзвінскай беларускай гімназіяй сабрана больш 1000 народных песень, казак і інш.) і на далейшае яго збіранне*"[1318].

Настаўнікі і вучні гімназіі ўзнавілі традыцыю рэйдаў па латгальскіх вёсках з мэтай нацыянальна-культурнага выхавання. Вучні разам з С. Сахаравым ставілі ў вёсках беларускія п'есы, ладзілі выступы хору і чыталі вершы[1319]. Так, 15 траўня 1927 г. адбылася экскурсія ў Краславу, у якой узялі ўдзел 42 вучні і трое настаўнікаў на чале з дырэктарам. Падчас вандроўкі вучні далі ў мясцовым клубе спектакль-канцэрт. Драматычны гурток (пад кіраўніцтвам П. Жэрдзі) паказаў п'есу *Пінская шляхта*, пасля вучнёўскі хор заспяваў беларускія песні. Перад гэтым С. Сахараў распавёў прысутным пра

[1313] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 112, л. 9.

[1314] *Летапіс гімназіі*, "Школьная праца" 1927, № 7, с. 17.

[1315] *Хроніка беларускага жыцьця ў Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, 1(11), с. 160.

[1316] LVVA, 2067 f., 1 ap., 376 l., 20 lp.

[1317] *Беларускі фальклёр*, "Наша доля" 1930. № 2 ад 7 лютага, с. 4.

[1318] LVVA, f. 2924, apr. 1, l. 83, 24 lp.

[1319] *Культурныя паходы вучняў Дзьвінскае Беларускае гімназіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1929, № 9(1), с. 15.

становішча гімназіі і беларускай меншасці ў Латвіі[1320]. У летні час вучні, якія не ехалі дадому на вакацыі, працавалі дзеля гімназіі: перапляталі падручнікі, займаліся сталяркай (у прыватнасці, рабілі цацкі для дзіцячага садка)[1321].

У гімназіі ладзіліся мерапрыемствы, звязаныя з істотнымі падзеямі ў грамадска-палітычным жыцці Латвіі. Вучні выступалі падчас агульнадзяржаўных урачыстасцяў, такіх як Тыдзень здароўя (10–17 кастрычніка 1926 г.), Дзень незалежнасці Латвіі (18 лістапада) і інш. 17 і 18 сакавіка 1927 г. настаўнікі і вучні зладзілі ўрачыстасць у памяць першага прэзідэнта Латвіі Я. Чакстэ. Настаўнік Закону Божага а. С. Трубіцын адслужыў паніхіду па нябожчыку, а кіраўнік БША і кіраўнік гімназіі прамовілі да ўдзельнікаў. З ініцыятывы кіраўніцтва гімназіі беларускае настаўніцтва вырашыла заснаваць стыпендыю для беларускай студэнцкай моладзі ў гонар памерлага прэзідэнта[1322]. Сярод стыпендыятаў былі: Пятро Мірановіч (810 латаў штомесяц), Казімір Мяжэцкі (115), Серафім Дынабургскі (172), Міхась Калінін (200), Валянціна Казлоўская (30 – аднаразова)[1323]. 20 лютага 1930 г. С. Сахараў звярнуўся да К. Езавітава з просьбай падрыхтаваць успаміны-рэферат пра латвійскага дзеяча, сябра беларускай меншасці Я. Райніса, бо гімназія ладзіла вечарыну яго памяці. Тыя ўспаміны С. Сахараў меркаваў надрукаваць у выданні "Школьная праца" альбо асобным зборнікам[1324].

Гімназія, флагман беларускай асветы ў Латвіі, трымала сувязь з пачатковымі школамі. Хоць і яе ўласны матэрыяльны стан быў не найлепшы, гімназія па магчымасці дапамагала найбяднейшым вясковым школам. 18 студзеня 1928 г. С. Сахараў бясплатна перадаў кіраўніку Дабрачынскай беларускай школы па 20 асобнікаў *Дудкі беларускай* Ф. Багушэвіча і *Казак жыцця* Я. Коласа, а таксама 5 асобнікаў *Беларускага календара*[1325]. У лістападзе 1928 г. дырэктарка Зарэцкай школы Алена Ліпень, арганізуючы вечарыну на патрэбы найбяднейшых вучняў, прасіла інспектара беларускіх школ атрымаць у гімназіі неабходнае для латарэі і кіно[1326]. Былі таксама кантакты паміж гімназіяй і 2-й Рыжскай беларускай школай[1327]. Пры гімназіі працавалі штогадовыя летнія курсы ўдасканалення настаўнікаў пачатковых

[1320] *Летапіс гімназіі*, "Школьная праца" 1927, № 7, с. 19.

[1321] *Хроніка беларускага жыцьця у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 2(12), с. 177.

[1322] *Акт на Беларускіх Настаўніцкіх Курсах*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1927, № 5(3), с. 58; *Урачыстасьці ў Дзьвінскай гімназіі з поваду сьмерці Прэзыдэнта*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1927, № 5(3), с. 58.

[1323] LVVA, 2924 f., 1 ap., 8 l., 1 lp.

[1324] LVVA, 2067 f., 1 ap., 364 l., 591 lp.

[1325] LVVA, 2067 f., 1 ap., 364 l., 239 lp.

[1326] LVVA, 2125 f., 5 ap., 107 l., 28 lp.

[1327] 22 траўня 1929 г. К. Езавітаў даслаў кіраўніцтву гімназіі групавы здымак вучняў і настаўнікаў сваёй школы з подпісам: "*Нам было-б дужа прыемна даведацца, што Вы,*

школ. Курсамі кіраваў дырэктар гімназіі. Яны завяршаліся іспытамі, вытрымаўшы якія, педагогі атрымлівалі права працаваць у 6-гадовых пачатковых школах[1328].

Шчыльную сувязь з гімназіяй трымалі такія дзеячы, як В. Ластоўскі, А. Луцкевіч, Я. Райніс, Б. Брэжга, К. Езавітаў. Гімназія не абмяжоўвалася працай з даўгаўпілскімі беларусамі, намагаючыся пашыраць кантакты з прадстаўнікамі іншых народаў, а таксама з суродзічамі за мяжой. Кіраўніцтва гімназіі трымала сувязь з літоўскім консульствам у Даўгаўпілсе. У прыватнасці, 27 кастрычніка 1926 г. яно выслала консулу і культурнаму аташэ асобнік газеты "Школьная праца"[1329]. У 1927 г. да С. Сахарава звярнуўся Янка Маразовіч з Вільні. Ад імя калектыву аўтараў, што рыхтавалі беларускі каляндар на 1927 год, ён прасіў даслаць падрабязныя звесткі пра гімназію, каб змясціць у выданні[1330]. Вядома, што гімназія падтрымлівала сувязі з беларускай кнігарняй у Вільні, замаўляючы беларускамоўныя выданні[1331].

Гімназія была адным з нешматлікіх месцаў у Латвіі, дзе жыла памяць пра Акт 25 сакавіка. 9–10 красавіка 1927 г. у гімназію завітаў былы прэм'ер БНР В. Ластоўскі, які прачытаў вучням дзве лекцыі *Галоўныя гістарычныя этапы беларускага народу і перспектывы яго на будучыню*, у якіх засяродзіўся на гісторыі Полацкага княства і Люблінскай уніі[1332]. У 1929 г., падчас урачыстасці, прысвечанай угодкам абвяшчэння БНР, вучні ўшанавалі памяць змагароў за беларускае нацыянальна-сацыяльнае адраджэнне, а хор, які складаўся з вучняў гімназіі, курсантаў і настаўнікаў, выканаў беларускі гімн[1333]. 23 сакавіка 1930 г. у гімназіі прайшла вечарына з нагоды чарговай гадавіны абвяшчэння БНР. Падчас мерапрыемства з дакладам *Становішча беларусаў у XIX і XX стагоддзі* выступіў С. Сахараў. Ён адзначыў, што, нягледзячы на нацыянальны прыгнёт у царскай Расіі, беларускі народ усё ж не страціў свайго нацыянальнага аблічча і заявіў пра сваё права на ўласную дзяржаву ў сакавіку 1918 г. Пасля чаго настаўнік гімназіі і былы ўдзельнік узброенага змагання за незалежнасць БНР А. Якубецкі распавёў прысутным пра

прыняўшы падарунак нашае школы, заказалі-б для яго рамачку і павесілі ў зале свае школы". LVVA, 2067 f., 1 ap., 364 l., 509 lp.

[1328] За чатыры гады існавання курсаў іх скончылі такія настаўнікі, як: Мікалай Талерка, Данат Казлоўскі, Антаніна Салаўёва, Эдвард Вайводзіш, Люцыя Габран, Антон Клагіш, Вільгельм Мірановіч, Васіль Руднікаў, Клара Багінская, Марыя Фёдарава, Феліцыян Астроўскі, Язэп Клагіш, Канстанцін Александровіч, Мікалай Краўчанка, Пятро Масальскі, Ян Зэйгліш і інш. LVVA, 2067 f., 1 ap., 331 l., 83 lp.

[1329] LVVA, 2067 f., 1 ap., 386 l., 18 lp.

[1330] LVVA, 2067 f., 1 ap., 364 l., 290 lp.

[1331] LVVA, 2067 f., 1 ap., 364 l., 10 lp.

[1332] *Летапіс гімназіі*, "Школьная праца" 1927, № 7, с. 18.

[1333] LVVA, f. 3235, apr. 6, l. 196, 212 lp.

значэнне І усебеларускага з'езда. Скончылася вечарына пастаноўкай *Жаніцьба па радыё*[1334].

Творчыя здольнасці вучні маглі рэалізаваць у гуртках. У 1927 г. у гімназіі працавалі радыётэхнічны, друку і літаратурна-гістарычны гурткі. Сябры апошняга 12 красавіка 1927 г. зладзілі вечарыну, падчас якой быў прачытаны рэферат пра алкаголь і яго шкодны ўплыў на чалавечы арганізм, а таксама разыграны абразок М. Гарэцкага *Атрута*[1335].

Кіраўніцтва рабіла спробы адрадзіць у гімназіі скаўцкі рух. 24 верасня 1926 г. школа набыла скаўцкі штандар расфарміраванай Лудзенскай беларускай гімназіі[1336]. 2 лютага 1927 г. школьная рада даручыла А. Якубецкаму стварыць скаўцкі аддзел[1337]. Увесну 1927 г. быў створаны 105-ы скаўцкі аддзел (10 вучняў), які 28 траўня склаў урачыстую прысягу[1338]. 15 студзеня 1928 г. у гімназіі быў створаны гурток Латвійскага чырвонага крыжа, у які запісалася 40 вучняў[1339]. Падчас уручэння атэстатаў у 1931 г. С. Сахараў прапанаваў заснаваць Таварыства матурыстаў Даўгаўпілскай дзяржаўнай беларускай гімназіі, а ў 1932 г. склікаць злёт выпускнікоў усіх дзесяці выпускаў[1340]. Аднак гэтай задуме не было наканавана здзейсніцца.

Згодна з задумай кіраўніцтва гімназіі ўдзел вучняў у вышэйзгаданых гуртках і калектывах павінен быў спрыяць фарміраванню беларускай інтэлігенцыі. С. Сахараў наступным чынам характарызаваў вынікі нацыянальна-патрыятычнай і творчай працы ў гімназіі: "*Прыемна было назіраць, як з сялянскай дзяўчыны або хлопца паступова фарміруецца чалавек – інтэлігент з сваім імкненнем і светапоглядам*"[1341]. Ён лічыў, што большасць выхаванцаў гімназіі не адхіляецца ад народа, а моцна трымаецца з ім, працуе дзеля паляпшэння яго долі і складае маладую нацыянальна свядомую беларускую інтэлігенцыю[1342]. Дзеяч наступным чынам выказваўся пра ролю гімназіі ў фарміраванні беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі: "*Беларускі народ цярпеў і зараз церпіць больш усяго ад сваёй цемнаты і няветлівасці. Без веды, без арганізацыйна-культурна-прасветнай працы ў гуртках, без самаасветы, без жывога нацыянальнага агню наша моладзь не будзе разбірацца*

[1334] *Хроніка*, "Наша доля" 1930. № 4 ад 8 красавіка, с. 4.

[1335] *Летапіс гімназіі*, "Школьная праца" 1927, № 7, с. 18.

[1336] LVVA, 2067 f., 1 ap., 376 l., 23 lp.

[1337] LVVA, 2067 f., 1 ap., 376 l., 4 lp.

[1338] *Летапіс гімназіі*, "Школьная праца" 1927, № 7, с. 19.

[1339] *Гурток моладзі Латвійскага чырвонага крыжу пры гімназіі*, "Школьная праца" 1928, № 10, с. 18.

[1340] *Выпускныя акты*, "Думка беларуса" 1931, № 2, с. 3.

[1341] М. Ліс, *Педагагічная і культурна-асветніцкая дзейнасць С.П. Сахарава*, "Весці Акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук" 1995, № 3, с. 103–104.

[1342] *Летапіс гімназіі*, "Школьная праца" 1927, № 7, с. 17.

ў віры розных пытанняў складнага грамадскага жыцця і крытычна адносіцца к ім, а прымушана будзе бяспомачна і жаласна патвараць другім і выказваць чужыя думкі (...) наша моладзь, наша інтэлігенцыя ніколі не павінна адрывацца ад свайго беларускага народа. Наадварот, ёй заўсёды неабходна быць з народам, блізка к яго патрэбам і імкненням, любіць яго мову, яго быт, ад народа яна зачэрпніць сваю энергію і моц, ад народа яна навучыцца шанаваць сваю нацыю і працаваць дзеля яе; народ жа адзнача тыя шляхі, па якіх ёй патрэбна ісці. Не павінна быць сярод беларускай моладзі такіх 'разумных' сынкоў і дачок, якія, скончыўшы сярэднія школы ці папаўшы ў вышэйшыя школы, стыдаюцца сваіх бацькоў-мужыкоў, сваёй роднай мовы. Дзяржыся ж за сваё роднае карэнне, за скарб сваёй самабытнасці, за жывую народную крыніцу наша моладзь – наша беларуская надзея, бо тады толькі зацвіце наша маладая беларуская культура, узойдзе сонца і настане лепшае жыццё"[1343].

Не абышлося ў гісторыі гімназіі і без трагедый. Напрыклад, 6 ліпеня 1930 г. вучаніца Алімпія Мяжэцкая скончыла жыццё самагубствам (утапілася). Выказваючы спачуванне бацьку, Дамініку Мяжэцкаму з Пасеншчыны, дырэктар С. Сахараў адзначыў, што "гімназія вельмі сумуе, што ў персоне Алімпіі згубіла добрую вучаніцу і свядомую беларуску"[1344].

Працу гімназіі рэгулярна інспектаваў кіраўнік Беларускага школьнага аддзела і прадстаўнікі канцылярыі міністра асветы. Іх высновы не заўсёды былі здавальняючыя. Архіўныя матэрыялы дазваляюць меркаваць, што адносіны паміж кіраўніцтвам БША і дырэктарам гімназіі С. Сахаравым склаліся не найлепшым чынам. Апошні неаднаразова выказваў гатоўнасць падаць у адстаўку. Упершыню ён выказаў такое жаданне пасля таго, як у траўні і ліпені 1928 г. рэвізія выявіла парушэнні ў працы гімназіі. У яе выніку С. Сахараў атрымаў вымову за тое, што не выдаў дакументы вучню Голубеву, які паскардзіўся міністру асветы на паводзіны дырэктара. Кіраўнік гімназіі, які не лічыў сябе вінаватым, звярнуўся ў БША з заявай аб вызваленні яго ад пасады. Аднак пад уплывам іншых сяброў Рады Беларускага школьнага аддзела (перадусім К. Езавітава) С. Сахараў забраў заяву[1345]. 21 верасня 1928 г. на пасяджэнні Рады БША было абмеркавана становішча гімназіі. Кіраўнік аддзела У. Пігулеўскі падкрэсліў, што педагагічны, выхаваўчы і нацыянальны бакі жыцця гімназіі не знаходзяцца на належным узроўні. Ён быў вельмі крытычны да працы калектыву гімназіі, адзначаючы, што бачыць два перыяды яе існавання – нацыянальны (да беларускага працэсу) і рэакцыйны (пасля яго). Кіраўнік Беларускага школьнага аддзела лічыў, што

[1343] С. Сахараў, *Да гісторыі Дзвьнскай дзяржаўнай беларускай гімназіі*, "Школьная праца" 1926, № 6, с. 4.

[1344] LVVA, 2067 f., 1 ap., 402 l., 155, 156 lpp.

[1345] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 90–91 lpp.

С. Сахараў вядзе школу да поўнага раскладу і поспехі на педагагічнай ніве немагчымыя без нацыянальнага жыцця гімназіі. Ён сцвярджаў, што педагагічны склад гімназіі большы чым на першым этапе існавання, але настаўнікі і інструктары-беларусы не праяўляюць належнай нацыянальнай актыўнасці. У. Пігулеўскі вінаваціў кіраўніка гімназіі ў бяздзейнасці і казаў, што неабходна ўліць у гімназію новыя сілы. Тым часам справавод аддзела Я. Шчорс звярнуў увагу на бяздзейнасць даўгаўпілскага настаўніцтва. Інспектар Я. Кастылюк выказаў думку, што прычынай клопату з'яўляецца адсутнасць у гімназіі новых нацыянальна свядомых беларускіх педагагічных кадраў. Ён прапаноўваў накіраваць на педагагічную працу ў Даўгаўпілс К. Езавітава. У выніку прысутныя выдалі пастанову пра неабходнасць звярнуць асаблівую ўвагу на становішча гімназіі і прапанаваць К. Езавітаву заняць пасаду кіраўніка мясцовай пачатковай школы[1346].

22 лістапада 1928 г. на паседжанні школьнай рады С. Сахараў зноў заявіў пра жаданне пакінуць пасаду дырэктара. Сябры школьнай рады былі засмучаныя і прасілі, каб ён дзеля дабра справы застаўся ў гімназіі настаўнікам[1347]. Аднак адстаўка С. Сахарава не была прынятая. У снежні 1930 г. і студзені 1931 г. С. Сахараў абвясціў школьнай радзе, што ён атрымаў з Міністэрства асветы загад аб зняцці яго з пасады дырэктара. У абарону кіраўніка выступіў калектыў гімназіі. Школьная рада вырашыла звярнуцца ў міністэрства і даведацца прычыны звальнення[1348]. 1 студзеня 1931 г. С. Сахараў быў праведзены міністрам на пасаду в.а. дырэктара гімназіі. Міністэрства тлумачыла свае дзеянні тым, што С. Сахараў няздатны як адміністратар. 18 чэрвеня 1931 г. школьная рада ўхваліла зварот да міністэрства з просьбай пакінуць яго кіраўніком гімназіі[1349]. 20 чэрвеня 1932 г. школьная рада гімназіі звярнулася ў БША з прапановай парупіцца, каб С. Сахараў захаваў пасаду дырэктара[1350].

На пачатку 1930-х гг. існаванне гімназіі апынулася пад пытаннем. У сувязі з пагаршэннем матэрыяльнай сітуацыі ў гады сусветнага эканамічнага крызісу, паменшылася колькасць кандыдатаў у гімназію. У 1930/31 гг. адбыліся выпускныя іспыты, калі ў 4-м класе налічвалася толькі 14 вучняў. У 1931/32 гг. у гімназіі было 78 вучняў[1351], у тым ліку ў 1-м класе – 15 чал., у 2-м класе – 24, у 3-м класе – 22, у 4-м класе – 17[1352]. Дырэктар С. Сахараў тлумачыў нешматлікасць наступным чынам: "*У звязку з сучасным эканамічных крызісам*

[1346] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 77 lp.

[1347] LVVA, 2067 f., 1 ap., 376 l., 42 lp.

[1348] LVVA, 2067 f., 1 ap., 377 l., 39 lp.

[1349] LVVA, 2067 f., 1 ap., 377 l., 42 lp.

[1350] LVVA, 2067 f., 1 ap., 377 l., 61 lp.

[1351] AAN, sygn.: MSW, t. IV/89, Sprawozdanie z życia mniejszości narodowych za II kwartał 1932 r., k. 38–39.

[1352] LVVA, 1632 f., 2 ap., 499 l., 49 lp.

і тым, што бацькі вучняў у значнай меры малазямельныя сяляне, гаспадарка якіх падупала, маецца задолжанасць у звязку з хутарным перасяленнем і таму бацькам цяжка, а падчас і зусім немагчыма ўтрымліваць сваіх дзетак у горадзе, у сярэдняй школе"[1353]. Каб павялічыць колькасць вучняў 18 траўня 1931 г. дырэктар гімназіі С. Сахараў звярнуўся да кіраўніка БША з просьбай надрукаваць 600 асобнікаў адозвы да беларускіх бацькоў з заклікам высылаць дзетак у школу[1354].

Змяншалася колькасць вучняў у гімназіі і праз тое, што з 1931 г. аплата за навучанне вырасла з 80 да 100 латаў. У сувязі з гэтым кіраўніцтва школы было вымушана стражэй разглядаць просьбы пра вызваленне ад аплаты. У 1931/32 гг. з 78 навучэнцаў толькі 40 магло разлічваць на 25% зніжкі аплаты за навучанне. Кіраўніцтва гімназіі меркавала, што скончыць год са значным дэфіцытам бюджэту[1355]. У 1931/32 гг. Культурны фонд Латвіі скараціў выдаткі на школы, не прадугледзеўшы сродкаў на дапамогу беларускім школам[1356]. У адказ 17 жніўня 1931 г. школьная рада гімназіі звярнулася ў БША з просьбай пахадайнічаць перад Культурным фондам Латвіі пра дапамогу для найбяднейшых вучняў, а калі няма магчымасці – закупіць для школы падручнікі. Адначасова рада звярнулася да беларускай грамадскасці з заклікам заснаваць стыпендыю для найбяднейшых і найлепшых вучняў. Адрасатамі закліку былі: кіраўнік Беларускага школьнага аддзела У. Пігулеўскі, інспектар беларускіх школ П. Журкоўскі, Н. Пінская і Н. Мікалаева-Комісар[1357]. Адначасова кіраўніцтва гімназіі спрабавала атрымаць дапамогу ад урада. На адным з пасяджэнняў школьная рада прыняла наступную пастанову: "*Прымаючы пад увагу, што Дзвінская дзяржаўная беларуская гімназія з'яўляецца адзінаю гімназіяю на ўсю Латгалію, што беларускае жыхарства з'яўляецца найбольш эканамічна слабым і нацыянальна маласвядомым, што беларусы часта падпадаюць пад польскія і расейскія ўплывы і аддаюць сваіх дзетак вучыцца ў польскія і расейскія гімназіі, якія маюць у сваім распараджэнні большыя сродкі і больш могуць прынесці дапамогі вучням сваім, прасіць Беларускі аддзел узбудзіць хадатайство перад Радай міністраў аб водпуску Дзвінскай дзяржаўнай беларускай гімназіі 2000 лат на дапамогу бяднейшым вучням гімназіі*"[1358].

Адначасова са скарачэннем фінансавання ўвесну 1932 г. у Міністэрстве асветы наспявала думка пра закрыццё гімназіі. Беларускі актыў бачыў у гэтым праяву латышскага нацыяналізму, які засяродзіў увагу на найслабей

[1353] LVVA, 2067 f., 1 ap., 387 l., 89 lp.
[1354] LVVA, 2067 f., 1 ap., 365 l., 11 lp.
[1355] LVVA, 2067 f., 1 ap., 377 l., 48 lp.
[1356] LVVA, 2067 f., 1 ap., 365 l., 27 lp.
[1357] LVVA, 2067 f., 1 ap., 365 l., 51 lp.
[1358] LVVA, 2067 f., 1 ap., 377 l., 44 lp.

арганізаванай і найменш свядомай у нацыянальным сэнсе беларускай меншасці. Захадам Міністэрства асветы папярэднічалі публікацыі ў прэсе, аўтары якіх выказвалі думку пра шкоднасць далейшай працы гімназіі. У газеце "*Jaunākās ziņas*" ад 26 жніўня 1932 г. выйшаў артыкул, у якім сцвярджалася, што сярод педагогаў беларускай гімназіі шмат некваліфікаваных. Неўзабаве пасля гэтага гімназія правяралі міністэрскія чыноўнікі, ім не падабалася, што 76–78% вучняў вызваленыя ад аплаты за навучанне. У латышскіх гімназіях гэта лічба складала 30%. Акрамя таго, чыноўнікі пералічвалі шматлікія выяўленыя факты злоўжыванняў і безгаспадарчасці кіраўніцтва школы[1359]. Міністэрства было незадаволена і кепскімі вынікамі выпускных іспытаў: у 1932 г. іх здавалі 11 вучняў, з якіх 4 не вытрымалі іспыту па лаціне і адзін – па латышскай мове. На думку інспектара, беларускія гімназія прадэманстравала найгоршыя вынікі сярод гімназій нацменаў: рускіх, палякаў і габрэяў. Акрамя таго, ён сцвярджаў, што на 17 педагогаў гімназіі толькі 5 мае ліцэнзію на навучанне, а кіраўніцтва штучна завышае колькасць вучняў шляхам павышэння аплат за навучанне. Інспекцыі таксама сцвярджала, што ў гімназіі вядзецца антыдзяржаўная агітацыя[1360].

19 жніўня 1932 г. на пасяджэнні школьнай рады гімназіі кіраўнік БША паведаміў, што міністэрства мае намер зачыніць гімназію, пачынаючы з ліквідацыі 1-га класа. Сябры рады выказвалі шкадаванне з гэтай нагоды і падкрэслівалі, што беларуская моладзь не зможа наведваць гімназію ў Рызе, бо пераважная большасць паходзіць з Латгаліі. Кс. Я. Гайлевіч выказаў меркаванне, што ў выпадку ліквідацыі школы незаможныя беларускія дзеці з Прыдруйшчыны, Пустыншчыны і іншых валасцей страцяць магчымасць атрымаць сярэднюю асвету. На прапанову Г. Цэльяда школьная рада стварыла камісію па падрыхтоўцы петыцыі да міністра асветы. У склад камісіі ўвайшлі: С. Сахараў, У. Раткін і Г. Цэльяд. Апошняму і А. Барткевічу было даручана паехаць у Рыгу, уручыць мемарандум міністру[1361].

Але ўлады ў Рызе засталіся непахіснымі ў сваім рашэнні. На падставе інспекцыі чыноўнікі міністэрства 25 жніўня 1932 г. падрыхтавалі заключэнне, у якім сцвярджалася, што гімназію належыць зачыніць пачынаючы з ліквідацыі 1-га і 2-га класаў. Аднак, узяўшы пад увагу інтарэсы здольных вучняў, закрыццё школы належала ажыццявіць паступова, пакідаючы 3-ці і 4-ы класы. Вучням гэтых класаў мусілі быць створаныя ўмовы для пераходу ў Даўгаўпілскую гарадскую гімназію і Рыжскую беларускую гімназію, дзе павінен быў адчыніцца інтэрнат з харчаваннем[1362]. 27 жніўня 1932 г.

[1359] LVVA, 1632 f., 2 ap., 499 l., 51 lp.
[1360] LVVA, 1632 f., 2 ap., 499 l., 52 lp.
[1361] LVVA, 2067 f., 1 ap., 378 l., 1–3 lpp.
[1362] LVVA, 1632 f., 2 ap., 499 l., 55 lp.

Міністэрства асветы паінфармавала Беларускі школьны аддзел пра ліквідацыю 1-га класа гімназіі і адкрыццё замест яго ў латышскай Даўгаўпілскай дзяржаўнай гімназіі беларускага камплекту і стварэнне пры Рыжскай беларускай гімназіі інтэрната з харчаваннем[1363].

Частка беларускага актыву ўсклала віну на кіраўніцтва Беларускага школьнага аддзела, якое не здолела супрацьдзейнічаць ліквідацыі гімназіі. Падчас канферэнцыі рыжскага беларускага настаўніцтва 17 сакавіка 1933 г. К. Езавітаў адзначыў у сваім выступе, што Рада БША не выкарыстала сваіх магчымасцей, каб спыніць працэс закрыцця гімназіі. Аднак кіраўнік Беларускага школьнага аддзела У. Пігулеўскі не прызнаваў віны сцвярджаючы, што адсутнасць з яго боку належнай рэакцыі была вынікам таго, што ён у апошні момант (за паўгадзіны ці гадзіну да пасяджэння Рады міністраў) даведаўся, што ўлады вырашылі ліквідаваць 1-ы клас беларускай гімназіі. Таксама ён лічыў, што ў закрыцці вінаватая не толькі Рада БША, але таксама "фракцыі, якія вымагалі аднаўлення гімназіі"[1364].

Нельга сказаць, што беларуская грамадскасць пасіўна назірала за закрыццём гімназіі. 26 жніўня 1932 г. кіраўніцтва таварыства "Беларуская хата" звярнулася да міністра з пратэстам у сувязі з інфармацыяй у прэсе пра планы закрыць гімназію[1365]. У яе абарону выступіла кіраўніцтва ТБНЛ. На наступны дзень быў скліканы надзвычайны сход сяброў управы арганізацыі. Удзельнікі прынялі рэзалюцыю, падкрэсліўшы, што захады міністра супраць беларускай гімназіі супярэчсць заканадаўству і парушаюць правы нацыянальных меншасцей. Аўтары рэзалюцыі аспрэчылі абвінавачанні міністра на адрас гімназіі і заклікалі яго перагледзець рашэнне. У прыватнасці, яны адзначалі, што вызваленне вялікай колькасці вучняў ад аплаты тлумачыцца тым, што ў гімназіі шмат дзяцей з незаможных сялянскіх сем'яў. Пры гэтым аўтары падкрэслівалі, што кошты вызвалення вучняў ад аплат пакрываюцца не з дзяржаўных крыніц, а са сродкаў школьнай рады. Яны заяўлялі, што толькі 40% навучэнцаў было вызвалена ад аплаты за кошт дзяржавы, а астатнія 37% вучыліся дзякуючы дапамозе педагагічнай рады і ахвяраванням настаўнікаў[1366]. Асабліва беларусам не падабалася тое, што рашэнне пра ліквідацыю 1-га класа было прынята ў час, калі завяршаўся набор у яго вучняў. Захады міністра назвалі недапушчальным і нясвоечасовым крокам, які "*выкідае на брук 32 беларускіх юнакоў, што ў працягу даўгіх 7 гадоў*

[1363] LVVA, 1632 f., 2 ap., 499 l., 47 lp.

[1364] LVVA, 2125 f., 5 ap., 14 l., 8 lp.

[1365] LVVA, 1632 f., 2 ap., 499 l., 36–38 lpp.

[1366] *Рэзалюцыя Надзвычайнага Агульнага Сходу сяброў "Т-ва Беларускіх вучыцялёў у Латвіі" ад 27 жніўня 1932 году, у справе Дзьвінскае Беларускае Дзяржаўнае гімназіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 4(14), с. 196.

рыхтаваліся да паступлення ў беларускую гімназію"[1367]. Дзеянні міністра разглядалі як удар па ўсёй беларускай меншасці і крокам у бок ліквідацыі беларускай культурна-асветнай аўтаноміі. Пры гэтым аўтары рэзалюцыі лічылі, што аргументы, якімі карысталіся ўлады, не адпавядалі рэчаіснасці. Яны адзначалі, што нястача кваліфікаваных кадраў у гімназіі з'яўляецца часовай з'явай, якая назіраецца і ў школах іншых нацыянальнасцей. Аўтары лічылі, што захады ўрада могуць выклікаць абурэнне беларускага грамадства і моладзі, што дасць нагоду да "*розных непажаданых настрояў роспачы, незадавалення, расчаравання, знявер'я і раздражэння, з якімі беларускаму настаўніцтву будзе дужа цяжка змагацца і якія будуць псаваць латышска-беларускія адносны ў будучыні*"[1368]. У сувязі з гэтым удзельнікі схода прасілі міністра адклікаць рашэнне аб ліквідацыі 1-га класа і захаваць гімназію ў поўным складзе[1369].

29 жніўня 1932 г. дэлегаты ТБНЛ (Р. Плыгаўка, А. Родзька, М. Калінін, А. Рытаў) сустрэлася з міністрам асветы Атысам Кеніньшам (*Atis Ķeniņš*). Той сцвярджаў, што рашэнне аб ліквідацыі з'яўляецца не спантанным рухам, а вынікам працяглых назіранняў і разваг. Даводзячы сваю рацыю, палітык паставіў пад сумнеў прафесійныя якасці настаўнікаў гімназіі і яе дырэктара. На думку міністра, моладзь пакідае муры школы з атэстатам сталасці, але без належных ведаў. Ён пераконваў, што, страціўшы даўгаўпілскую гімназію, беларусы не губляюць нацыянальна-культурнай аўтаноміі, бо ў Рызе існуе паўнавартая беларуская сярэдняя школа. Міністр бачыў будучыню беларускіх гімназістаў пасля закрыцця школы наступным чынам. Тыя, хто жадае працягваць навучанне ў беларускай школе, будуць пераведзеныя ў Рыжскую беларускую гімназію, якая адразу будзе прынятая на дзяржаўнае ўтрыманне, атрымае дадатковую дапамогу і інтэрнат. Вучні, якія захочуць застацца ў Даўгаўпілсе, трапяць у Даўгаўпілскую дзяржаўную гімназію, дзе будзе ўведзены прадмет па беларусазнаўстве. Спрабуючы астудзіць эмоцыі беларусаў, міністр падкрэсліў, што ў будучыні ён не выключае магчымасці далучэння 1-га класа Даўгаўпілскай гімназіі да беларускай гімназіі ў Рызе. Аднак беларускія даўгаўпілскія і рыжскія арганізацыі выказаліся супраць такога кампрамісу. Пасля размовы з міністрам у беларусаў склалася трывалае ўражанне, што рашэнне аб ліквідацыі гімназіі мае палітычны характар, бо ўлады лічаць беларускую меншасць няпэўнай у палітычным сэнсе, а ў Даўгаўпілсе мала латышскага духу і пануе засілле меншасцей[1370]. Падчас сустрэчы з міністрам К. Езавітаў раскрытыкаваў дзеянні палітыка, называючы

[1367] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 27, л. 2.

[1368] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 27, л. 5.

[1369] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 27, л. 5–6.

[1370] Г. Плыгаўка, А. Родзька, А. Рытаў, М. Калінін, *Гутарка беларускай дэлегацыі з грамадзянінам Міністрам Асьветы*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 4(14), с. 198–199, 207.

іх неадпаведнымі. Беларускі дзеяч прасіў міністра адтэрмінаваць рашэнне пра ліквідацыю на год, каб беларусы мелі час давесці сваю лаяльнасць латвійскай дзяржаве[1371].

31 жніўня 1932 г. Даўгаўпілскі беларускі актыў (таварыства "Беларуская хата" – П. Масальскі, таварыства "Прасвета" – П. Жэрдзі, таварыства "Рунь" – Л. Тэтар, ТБМЛ – У. Гусарэвіч і М, Калінін, ТБНЛ – Р. Плыгаўка і А. Родзька, даўгаўпілскае настаўніцтва – М. Жданоўскі і В. Бікоўскі) накіраваў прэм'ер-міністру пратэст супраць спынення набору ў 1-ы клас гімназіі. У дакуменце адзначалася, што рашэнне міністра было прынята пасля таго, як у клас ужо запісалася 29 вучняў. Аўтары звароту аспрэчылі інфармацыю міністэрства пра тое, што ў гімназіі працуе значная колькасць настаўнікаў без вышэйшай адукацыі і тых, якія працуюць на палову стаўкі. Аўтары адзначалі, што сярод 14 настаўнікаў гімназіі толькі настаўнік матэматыкі (няскончаная вышэйшая адукацыя) і беларускай мовы (выпускнік настаўніцкай семінарыі) не маюць універсітэцкай адукацыі, але з'яўляюцца дасведчанымі педагогамі. Адначасова яны тлумачылі, што некаторыя настаўнікі сапраўды працуюць у гімназіі на паўстаўкі, але гэта настаўнікі-латышы, якія выкладаюць латышскую і нямецкую мовы, спевы і гімнастыку. На думку аўтараў звароту, гэтых людзей міністэрства магло замяніць кваліфікаванымі педагогамі замест таго, каб зачыняць школу. У адказ на абвінавачанне ў антыдзяржаўнай дзейнасці ў мурах школы адзначалася, што яны базуюцца выключна на патаемных рапартах палітычнай паліцыі. Аўтары падкрэслівалі, што інфармацыя школьнай кураторыі пра тое, што 75% вучняў гімназіі вызвалена ад аплат за кошт дзяржавы непраўдзівая, бо насамрэч гэта лічба складае толькі 45–48%, а кошты навучання астатніх пакрывае школа з уласнага бюджэту. Беларускія дзеячы звярталі ўвагу, што закрыццё школы пагоршыць стаўленне беларускай меншасці да латвійскай дзяржавы і парушыць закон, які гарантуе нелатышам права на атрыманне пачатковай і сярэдняй асветы на роднай мове[1372].

Адначасова з захадамі па ліквідацыі гімназіі Міністэрства асветы змяніла дырэктара школы. Замест беларуса С. Сахарава быў прызначаны Фрыдрых Обштэйн, дырэктар Даўгаўпілскай дзяржаўнай гімназіі. У перыяд з 30 жніўня па 21 кастрычніка 1932 г. ён з'яўляўся в.а. дырэктара беларускай гімназіі. Першае пасяджэнне школьнай рады з удзелам новага кіраўніка адбылося 4 верасня 1932 г. У прысутнасці кіраўніка БША У. Пігулеўскага в.а. дырэктара Ф. Обштэйн паведаміў, што ў 1932/33 гг. гімназія будзе працаваць у старым будынку і ў ранейшым педагагічным складзе. Адначасова ён запытаў прысутных ці ўсе прадметы ў гімназіі выкладаюцца па-беларуску, на што атрымаў

[1371] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 64 lp.

[1372] LVVA, 1632 f., 2 ap., 499 l., 13 lp.

адказ, што ўсе – з выключэннем замежных моваў[1373]. У гімназіі налічвалася 46 вучняў (20 хлопцаў і 26 дзяўчат): у 2-м класе – 7 (2 хлопцы і 5 дзяўчат), 3-м – 19 (5 хлопцаў і 14 дзяўчат), 4-м – 20 (13 хлопцаў і 7 дзяўчат)[1374]. Беларускія крыніцы інфармавалі, што набраныя ў 1-шы клас у 1932 г. вучні (29 чал.) былі вымушаны раз'ехацца па хатах, паколькі ў адпаведнасці з рашэннем міністра 1-шы клас быў расфармаваны[1375]. Вядома, аднак, што ўжо 13 верасня 1932 г. 1-ы клас зноў быў адчынены. З 7 лістапада 1932 г. гімназія працавала ў 4-класным складзе. У гэты час у 1932 г. там навучалася 68 вучняў[1376].

Да новага дырэктара беларускі актыў ставіўся адмоўна. Яго прызначэнне лічылі вынікам палітычнай кан'юнктуры[1377]. Адным з першых крокаў Ф. Обштэйна была ліквідацыя майстэрняў і перанос у іншы будынак вучнёўскага інтэрната. Беларускі школьны аддзел у звароце да Міністэрства асветы аспрэчыў гэта рашэнне: у майстэрнях вучні атрымлівалі практычныя веды, дзякуючы якім маглі разлічваць на лепшую працу на прадпрыемствах. Кіраўніцтва БША прасіла міністра ануляваць рашэнне пра перанос вучнёўскага інтэрната. У дакуменце звярталася таксама ўвага на тое, што паводле закону дырэктар гімназіі не мог займацца ліквідацыяй майстэрняў і інтэрната без узгаднення са школьнай радай[1378].

У далейшым беларускі актыў не складаў зброі. 20 верасня 1932 г. кіраўніцтва таварыства "Рунь" выдала пратэст супраць закрыцця 1-га класа гімназіі і адкрыцця замест яго паралельнага класа ў латышскай гімназіі. Адначасова прадстаўніцы таварыства ў Радзе БША Л. Тэтар было даручана "*бараніць існавання самастойнай беларускай гімназіі ў поўнай лічбе яе класаў і адкінуць усялякія прапазіцыі, ад каго б яны не паходзілі, аб кампенсіраванні беларусаў заместа зачыненых класаў беларускай гімназіі паралельнымі класамі пры латышскай дзяржаўнай гімназіі*"[1379]. У верасні 1932 г. школьная рада гімназіі накіравала пратэст на імя прэм'ер-міністра з просьбай адмяніць рашэнне пра ліквідацыю школы. Аўтары лічылі аргументы на карысць закрыцця гімназіі беспадстаўнымі. У дакуменце адзначалася, што ліквідацыя школы пазбавіць незаможных вучняў першых класаў магчымасці атрымаць

[1373] LVVA, 2067 f., 1 ap., 378 l., 4 lp.

[1374] LVVA, 1632 f., 2 ap., 499 l., 19 lp.

[1375] К. Адраджэнец, *Замах на Дзьвінскую беларускую дзяржаўн. гімназію*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 4(14), с. 196.

[1376] LVVA, 2067 f., 1 ap., 378 l., 11 lp.

[1377] 27 жніўня 1932 г. К. Езавітаў пісаў У. Ціхаміраву, што Ф. Обштэйн быў прызначаны на пасаду кіраўніка гімназіі, бо з'яўляўся сябрам Дэмакратычнага цэнтра, а ў сапраўднасці ён не валодае добрымі педагагічнымі кваліфікацыямі, паколькі ў 1900 г. скончыў настаўніцкую семінарыю і вытрымаў іспыт на хатняга настаўніка рускай мовы. LVVA, 1897 f., 1 ap., 3 l., 37 lp.

[1378] LVVA, 1632 f., 2 ap., 499 l., 30–31 lpp.

[1379] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 60 lp.

асвету на роднай мове, бо не ўсе яны будуць у стане працягнуць навучанне ў Рызе. Сябры школьнай рады лічылі, што схільнасць да антыдзяржаўнай дзейнасці 2–3 вучняў (якія адразу ж былі выключаныя са школы), не дае падстаў рабіць высновы, што гімназія апанаваная антыдзяржаўнымі настроямі. Аўтары пратэсту рашуча аспрэчвалі, што, нібыта, кіраўніцтва гімназіі імкнулася штучна павялічыць колькасць вучняў. Яны падкрэслівалі, што абавязкам настаўнікаў з'яўляецца дбанне пра асвету моладзі, таму нікому не належыць адмаўляць у гэтым праве. Аўтары не пагаджаліся з тым, што педагагічны калектыў складаецца з недастаткова кваліфікаваных настаўнікаў, паколькі гэтыя ж людзі працуюць у іншых школах, і ніхто ніколі не меў да іх прэтэнзій. У дакуменце адзначалася, што высновы наконт нізкага ўзроўню ведаў вучняў на іспытах не адпавядаюць рэчаіснасці, бо былі зробленыя на падставе аналізу тэстаў. На думку аўтараў, толькі поўны аўдыт дазваляе меркаваць пра ўзровень падрыхтоўкі вучняў. Школьная рада лічыла таксама недарэчнымі заўвагі наконт неахайнага вядзення бухгалтэрыі школы, паколькі Кантрольная палата Латвіі не падзяляла гэтага меркавання[1380].

Беларускі актыў разглядаў рашэнне міністра асветы як свядомую праяву непрыхільнасці да беларускай меншасці і сімвал ігнаравання яе нацыянальна-культурных патрэб. У № 4(14) за 1932 г. часопіса "Беларуская школа ў Латвіі" пабачыў свет артыкул *Замах на Дзьвінскую Беларускую Дзяржаўную гімназію*. Публікацыя выклікала водгук сярод беларускай грамадскасці Латвіі і беларусаў у іншых краінах. Аўтар пісаў, што былі выпадкі зваротаў у латвійскія дыпламатычныя прадстаўніцтвы ў абароне гімназіі[1381]. Нам не ўдалося пацвердзіць апошняй інфармацыі, але вядома, што за лёсам гімназіі сачылі віленскія беларусы. На старонках "Беларускай крыніцы" гучалі пратэсты супраць спроб закрыцця школы[1382]. У адным з нумароў выдання сцвярджалася, што гімназія ўжо спыніла існаванне[1383]. Найбольш крытычны быў К. Езавітаў, які сцвярджаў, што міністр асветы імкнецца да свядомага разбурэння беларускага нацыянальнага цэнтра ў Даўгаўпілсе. На пасяджэнні Рады БША 22 верасня 1932 г. ён прапанаваў даручыць С. Сахараву і А. Барткевічу пачаць працу над узмацненнем нацыянальнага духу

[1380] LVVA, 1632 f., 2 apr., 499 l., 1–2 lpp.

[1381] К. Адраджэнец, *Водгукі беларускага грамадзтва з поваду замаху на Дзьвінскую гімназію*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 5(15), с. 214.

[1382] *Pachod procił biełaruskaha školnictwa ŭ Łatwii*, "Беларуская крыніца" 1933, № 26 ад 20 чэрвеня, с. 1; *У справе беларускай гімназіі ў Дзьвінску*, "Беларуская крыніца", № 27 ад 30 чэрвеня 1933 г., с. 1.

[1383] Аўтары зацемкі адзначалі, што 27 жніўня 1933 г. беларуская гімназія аб'яднаная з польскай і рускай гімназіямі ў Даўгаўпілсе ў 2-ю дзяржаўную гімназію, у якой быў створаны беларускі камплект. *З беларускага жыцьця ў Латвіі*, "Беларуская крыніца", № 35 ад 26 верасня 1933 г., с. 3.

на Даўгаўпілшчыне[1384]. На гэтым жа пасяджэнні сябры Рады канстатавалі, што з пачаткам ліквідацыі гімназіі значна аслабела беларуская нацыянальная пазіцыя ў Даўгаўпілсе[1385]. Удзельнікі ўхвалілі зварот да міністра асветы з просьбай адклікаць рашэнне пра паступовую ліквідацыю беларускай гімназіі і аднавіць яе далейшую нармальную працу, абмежаваўшыся зменай кіраўніцтва. Яны не падзялялі меркавання міністра пра бязладдзе ў гімназіі, але пагаджаліся, каб навучальны і выхаваўчы працэсы ў ёй былі пад асаблівым кантролем[1386].

Тым часам адбыліся змены ў педагагічным складзе. Замест Ф. Обштэйна кіраўніком школы быў прызначаны кс. Язэпс Чаманс, дэкан Дагдзенскага касцёла. 9 кастрычніка 1932 г., у часе пасяджэння школьнай рады, У. Пігулеўскі прадставіў новага дырэктара, што сустрэла аднагалосную падтрымку[1387]. Новы кіраўнік упершыню прысутнічаў на бацькоўскім сходзе 6 лістапада 1932 г., а на паседжанні школьнай рады – 25 лістапада 1932 г. 29 лістапада кіраўніцтва гімназіі вырашыла, што пратаколы пасяджэнняў школьнай рады будуць весціся на дзвюх мовах: беларускай і латышскай, а не толькі па-беларуску, як гэта было раней[1388]. Міністэрства асветы імкнулася звольніць з гімназіі асоб, якіх палітычная паліцыя вінаваціла ў нелаяльнасці. 19 верасня 1932 г. школьная рада гімназіі абмеркавала справу настаўніка У. Ціхаміравa, якому Міністэрства асветы ставіла ў віну ўдзел у антыдзяржаўнай дзейнасці. Праўда, школьная рада палічыла абвінавачанні неабгрунтаванымі і прасіла міністэрства дазволіць педагогу працаваць у гімназіі ў наступным навучальным годзе[1389]. 22 верасня 1932 г. Рада БША прыняла зварот да міністра асветы з прапановай працягнуць кантракт з настаўнікам У. Ціхаміравым тэрмінам на год[1390]. На тым самым пасяджэнні рады С. Сахараў адмовіўся далей выкладаць у гімназіі і выйшаў са складу школьнай рады[1391]. Адначасова ў гімназію былі прынятыя новыя настаўнікі, з якіх толькі адзін скончыў беларускія настаўніцкія курсы, а астатнія з'яўляліся "не-беларусамі і не ведаючымі беларускай мовы"[1392].

[1384] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 72 lp.

[1385] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 80 lp.

[1386] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 64 lp.

[1387] LVVA, 2067 f., 1 ap., 378 l., 8 lp.

[1388] LVVA, 2067 f., 1 ap., 378 l., 11 lp.

[1389] LVVA, 2067 f., 1 ap., 378 l., 6–7 lpp.

[1390] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 80 lp.

[1391] LVVA, 2067 f., 1 ap., 378 l., 7 lp.

[1392] Да іх ліку належалі: Густаўс Юрэвічс (латышская і лацінская мовы), Канстанцінс Азоліньш (грамадазнаўства), Ансіс Фрэйманіс (гісторыя і геаграфія Латвіі), Оскар Калейс (маляванне), Павел Капылоў (інструктар сталярнай майстэрні). Гімназіяльны, *Зьмены ў Дзьвінскай Дзяржаўнай Беларускай гімназіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 5(15), с. 213.

Апошні выпуск гімназіі адбыўся ў чэрвені 1933 г., калі школы скончыла 11 вучняў[1393]. Захаваліся звесткі пра гэтую падзею. 15 чэрвеня 1933 г. К. Мяжэцкі (старшыня) і Ф. Клагіш (сакратар) ад імя цэнтральнага праўлення ТБМЛ павіталі выпускнікоў наступнымі словамі: "*Верым і маем надзею, што, павялічыўшы шэрагі беларускае інтэлігенцыі, супольнымі сіламі зможам палепшыць долю беларускага народа*"[1394]. Рэдакцыя выдання "Беларуская школа ў Латвіі" 16 чэрвеня 1933 г. зычыла выпускнікам "*каб кожды а нова-выпушчаных беларускіх маладых інтэлігентаў далажыў усіх высілкаў, каб не спыніць сваю асвету і трапіць у Вышэйшую Школу. Беларуская меншасць у Латвіі, як і наагул Беларускі Адраджэнчы рух, чакаюць прыходу да працы маладых і высокакваліфікаваных сіл, каб з іх дапамогаю ўмацаваць стан нашае культурна-асветнае працы*"[1395]. Тым часам былы дырэктар гімназіі С. Сахараў ад імя кіраўніцтва ТБНЛ звярнуўся да выхаванцаў з наступнай прамовай: "*У цяжкую гадзіны Вы, матурысты, выходзіце ў жыццё, калі пануе не толькі эканамічны, але і духовы крызіс. Ад кожнага з нас у такі час патрабуецца вытрыманасць, моц духу, цвярозасць розуму і зялезная воля, каб перамоч усе адмоўныя бакі жыцця як для свайго, так і агульначалавечага шчасця. Маё шчырае жаданне, як Вашага былога настаўніка і кіраўніка гімназіі, каб Вы бадзёра і энергічна кавалі сабе светлую будучыню, каб Вы збераглі чыстым у жыцці свой нацыянальны беларускі твар, каб Вы ніколі не парывалі сувязь са сваім родным народам, з сваімі сваякамі і сваёй вёскай і каб Вы заўсёды былі ўдзячнымі і дабрадзейнымі сынамі дачкамі нашай дзяржавы – Латвіі!*"[1396].

У гэты час установа знаходзілася ў сур'ёзным фінансавым крызісе. У сакавіку 1933 г. Беларускі школьны аддзел інфармаваў пра скарачэнне бюджэту гімназіі. Гэта выклікала незадаволенасць школьнай рады, якая 24 сакавіка звярнулася да кіраўніка БША і дырэктара гімназіі з заклікам зрабіць належныя захады ў міністэрстве з мэтай павелічэння выдаткаў на ўтрыманне бедных вучняў[1397]. У наступным навучальным годзе сітуацыя беларускіх гімназістаў не палепшылася. 20 верасня 1933 г. настаўнік У. Раткін падчас пасяджэння Рады БША патрабаваў для гімназіі пільнай матэрыяльнай дапамогі. У выпадку адмовы, сцвярджаў ён, педрада здыме з сябе адказнасць за ўтрыманне ўстановы. Тым часам К. Езавітаў заклікаў кіраўніка Беларускага школьнага аддзела дапамагчы гімназіі і знайсці сродкі з бягучага гадавога

[1393] Гэты былі: Яўген Альхоўскі, Марта Багдановіч, Пятро Дрыслёнак, Валерыя Казачонак, Элія Оруб, Еўфрасіння Ціхамірава, Эдвард Цынгель, Любоў Чарняўская, Зінаіда Юхно, Віктар Эйсак, Пятро Заліўскі, Ян Малаток, Зоя Сільвановіч. *Хроніка беларускага жыцьця у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 5(22), с. 337.

[1394] LVVA, 2067 f., 1 ap., 411 l., 115 lp.

[1395] LVVA, 2067 f., 1 ap., 411 l., 85 lp.

[1396] LVVA, 2067 f., 1 ap., 411 l., 88 lp.

[1397] LVVA, 2067 f., 1 ap., 378 l., 30 lp.

бюджэту[1398]. 6 кастрычніка 1933 г. БША абавязаўся ўзяць на сябе ўтрыманне аднаго вучня, якому выплачваў 10 латаў штомесяц[1399]. Дапамагалі школе і настаўнікі. На пасяджэнні школьнай рады настаўнік Г. Цэльяд пагадзіўся ахвяраваць 10 латаў штомесяц на патрэбы найбяднейшых вучняў, а педрада гімназіі – 97[1400]. Акрамя таго, педкалектыў вырашыў ладзіць болей дабрачынных вечарын. Адна з іх (6 траўня 1933 г.) прынесла 149 латаў[1401]. 10 кастрычніка 1933 г. школьная рада прасіла дырэктара гімназіі дазволіць вучням адтэрміноўку аплаты за навучанне ў 1933/34 гг. да 1 красавіка 1934 г. У выпадку недатрымання тэрміну рада абавязвалася ўзяць на сябе выплату запазычанасці[1402].

У 1933/34 гг. гімназія ўваходзіла з запазычанасцю за мінулыя гады: за 1932/33 гг. – 632 латы і за 1931/32 – 134 латы[1403]. У сувязі з тым, што школа не была ў стане пагасіць дзяржаўную запазычанасць, 14 лютага 1934 г. педрада прыняла рашэнне прасіць улады ануляваць частку доўгу. Праз адсутнасць сродкаў на аплату электрычнасці ў інтэрнаце было вырашана дазволіць яго жыхарам рабіць вечарамі хатнія заданні ў класах. Адно з памяшканняў гімназіі было здадзена ў арэнду гарадскому самакіраванню, царкоўнаму хору, сельскагаспадарчым курсам і розным культурна-асветным арганізацыям[1404].

На пачатку 1934 г. дзяржаўныя кантралёры правялі інспекцыю ў гімназіі, вынікі якой былі нездавальняючымі. Чыноўнікі выявілі недакладнасці ў арганізацыі працы школы. Асаблівую ўвагу яны звярнулі на кепскі стан спраў у інтэрнаце. Кантралёры адмоўна паставіліся і да таго, што гімназія здае ў арэнду памяшканне на грамадскія і культурна-асветныя мерапрыемствы. Па выніках інспекцыі на гімназію было накладзена грашовае спагнанне. Тым часам, школьная рада канстатавала поўную адсутнасць сродкаў у гімназічнай касе і звярнулася ў Беларускі школьны аддзел з просьбай дабіцца ад уладаў скасавання часткі штрафу. Кепскае матэрыяльнае становішча рада тлумачыла не дрэннай фінансавай палітыкай гімназіі, а галечай вучняў, якім бесперапынна трэба было дапамагаць. Асаблівай дапамогі патрабавалі тыя, хто жыў у інтэрнаце, паколькі яны зусім не мелі сродкаў[1405].

Такім чынам можна канстатаваць, што становішча гімназіі было складанае. На пачатку 1930-х гг. над установай збіраліся чорныя хмары, а пагроза закрыцця набыла рэальны характар. Нягледзячы на цяжкасці і праблемы,

[1398] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 96 lp.
[1399] LVVA, 2067 f., 1 ap., 378 l., 38 lp.
[1400] LVVA, 2067 f., 1 ap., 378 l., 39 lp.
[1401] LVVA, 2067 f., 1 ap., 378 l., 37 lp.
[1402] LVVA, 2067 f., 1 ap., 378 l., 40 lp.
[1403] LVVA, 2067 f., 1 ap., 378 l., 41 lp.
[1404] LVVA, 2125 f., 5 ap., 366 l., 69 lp.
[1405] LVVA, 2067 f., 1 ap., 378 l., 54–59 lpp.

гімназія адыграла істотную ролю ў выхаванні нацыянальна свядомай беларускай моладзі ў міжваеннай Латвіі. За час існавання гімназіі з яе муроў выйшаў шэраг маладых беларускіх дзеячаў. Сярод іх можна згадаць Язэпа Клагіша, Пятра Мірановіча, Алеся Махноўскага, Пятра Журкоўскага, Паўла Пырсікава, Яна Карнавухава, Аляксея Барткевіча, Уладзіміра Гусарэвіча і інш. У ліку выхаванцаў гімназіі былі дзеці і сваякі некаторых беларускіх дзеячаў. Варта ўзгадаць дзяцей І. Краскоўскага – Сяргея і Людмілу, брата П. Мядзёлкі-Грыб – Зыгмунта Мядзёлку[1406]. У 1925 г. у гімназію паступілі дзець С. Сахарава – Сяргей і Галіна, а ў 1929 г. – Ірына[1407]. У 1928 г. у гімназію паступіў сын а. Савы Трубіцына – Глеб[1408].

Рыжская прыватная беларуская гімназія Таварыства беларускіх настаўнікаў у Латвіі. Працяглы час праблемай рыжскай беларускай вучнёўскай моладзі была адсутнасць у горадзе беларускай сярэдняй школы[1409]. У 1925 г. адбыўся першы выпуск вучняў 1-й Рыжскай беларускай пачатковай школы. Мясцовы актыў усведамляў патрэбу даць дзецям магчымасць атрымаць сярэднюю асвету на роднай мове. Сталічныя настаўнікі вырашылі заснаваць стыпендыю для найбольш здольных вучняў, якія жадалі працягнуць навучанне ў Даўгаўпілскай беларускай гімназіі. Першай стыпендыяткай стала Алена Шаблоўская, якая ў 1926 г. паехала вучыцца ў Даўгаўпілс[1410]. Адначасова рабіліся захады па стварэнні ў сталіцы беларускай сярэдняй школы. Увесну і ўлетку 1925 г. таварыства "Беларуская хата" звярталася ў Міністэрства асветы па дазвол на адкрыццё прыватнай беларускай гімназіі. Меркавалася, што яна будзе працаваць у другую змену ў будынку 1-й Рыжскай беларускай пачатковай школы. Арганізатары склалі спіс з 12 вучняў, бацькі якіх выказалі гатоўнасць паслаць іх у будучую гімназію. Але Міністэрства асветы не дало згоды на адкрыццё школы[1411].

У наступныя гады беларусы не перасталі дабівацца сярэдняй школы. Праз некалькі гадоў спробу стварыць у сталіцы прыватную гімназію зрабіла Таварыства беларускіх настаўнікаў у Латвіі. Такая ідэя прагучала 10 чэрвеня

[1406] Падчас паступлення ў гімназію за брата хадайнічала сястра ў жніўні 1922 г. LVVA, 2067 f., 1 ap., 367 l., 4 lp.

[1407] LVVA, 2067 f., 1 apr., 406 l., 4, 10, 24 lpp.

[1408] У вучнёўскай тэчцы адзначалася, што яго бацька быў рускамоўны, але сын належаў да "беларускай нацыі". LVVA, 2067 f., 1 ap., 407 l., 105 lp.

[1409] К. Езавітаў, *Асьветныя патрэбы беларусаў у Рызе*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1927, № 3(1), с. 25–26.

[1410] *Беларускае жыцьцё у Латвіі*, "Голас беларуса" 1926, № 3 ад 20 красавіка, с. 3.

[1411] Э. Екабсонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [в:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 62.

1929 г. на пасяджэнні Рады БША. Удзельнікі даручылі кіраўніцтву ТБНЛ зрабіць захады перад уладамі, каб атрымаць згоду на адкрыццё гімназіі[1412]. Гэтым разам справа скончылася поспехам. 19 ліпеня 1929 г. быў зацверджаны статут прыватнай вячэрняй гімназіі ТБНЛ у Рызе (*Latvijas baltkrievu skolotāju biedrības privātā ģimnāzija (Rīga)*)[1413].

Гімназія пачала працу ў 1929/30 гг. Школа не мела ўласнай нерухомасці, таму арандавала памяшканні ў Старым Горадзе (*Grēcinieku iela 28*). Але з фінансавых прычын 1 верасня 1931 г. яна пачала працаваць у будынку 1-й Рыжскай беларускай асноўнай школы на Маскоўскім Фарштаце (*Maskavas iela* 173). Заняткі адбываліся ў вячэрнюю змену[1414]. Пры гэтым адзін з класаў месціўся ў будынку 2-й Рыжскай беларускай асноўнай школы на Саркандаўгаве (*Sīmaņa iela 14*). Дырэктарам гімназіі быў прызначаны А. Родзька[1415]. Педагагічны калектыў складаўся з рыжскіх настаўнікаў, якія адначасова працавалі ў беларускіх пачатковых школах. 29 ліпеня 1929 г. управа ТБНЛ прапанавала наступны педкалектыў: кс. Анспок (Закон Божы для каталікоў), а. Міхаіл Грыўскі (Закон Божы для праваслаўных), М. Дзямідаў (беларуская мова), Оскар Сіман (нямецкая мова), А. Родзька (фізіка, матэматыка), П. Журкоўскі (хімія)[1416]. Аднак з часам склад настаўнікаў неаднаразова змяняўся, папаўняючыся новымі педагогамі. Падрабязнейшыя звесткі ўтрымлівае табліца.

Табліца 42. Педагагічны склад Рыжскай прыватнай гімназіі ТБНЛ у 1929–1934 гг.

1929/30 гг.	
Аляксандр Родзька	матэматыка, фізіка
Мікола Дзямідаў	беларуская мова
Парфіры Жэрдзі	прыродазнаўства
Пятро Журкоўскі	хімія
Міхась Краўчанка	
Сцяпан Сіцько	беларуская мова
Оскар Сіман	
1930/31 гг.	
Аляксандр Родзька	матэматыка, фізіка
Сцяпан Сіцько	беларуская мова

[1412] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 7 lp.

[1413] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 8 lp.

[1414] С. Сіцько, *Дзесяцігодзьдзе 1-ае Рыжскае беларускае аснаўное школы, 1923–1933*, Рыга 1934, с. 15.

[1415] *Хроніка*, "Пагоня" 1930, № 1, с. 12.

[1416] LVVA, 2125 f., 5 ap., 255 l., 21 lp.

Парфіры Жэрдзі	прыродазнаўства
Якуб Кастылюк	геаграфія
Пятро Мірановіч	маляванне
Вікторыя Доўгая	пластыка
Арнольдс Вевербрандс	латышская мова
Оскар Сіман	нямецкая мова
Аляксандр Шчорс	хімія, фізіка
Рыгор Багаяўленскі	руская мова
Генрых Гросэн	лацінская мова
1931/32 гг.	
Аляксандр Родзька	матэматыка, фізіка
Сцяпан Сіцько	беларуская мова і літаратура
Аляксандр Шчорс	хімія, фізіка
Казімір Мяжэцкі	прыродазнаўства
Уладзіслаў Мінчонак	лацінская мова і літаратура
Кастусь Езавітаў	беларуская мова
Вікторыя Доўгая	фізічнае выхаванне
Петэрыс Петэрсонс	
Рыгор Багаяўленскі	руская мова
Аляксандр Мекш	матэматыка, фізіка
1932/33 гг.	
Аляксандр Родзька	матэматыка, касмаграфія
Кастусь Езавітаў	беларуская мова; справавод
Сцяпан Сіцько	беларуская мова, усеагульная гісторыя і гісторыя Беларусі
Казімір Мяжэцкі	прыродазнаўства, геаграфія Беларусі, хімія
Арнольдс Вевербрандс	латышская мова
Якуб Кастылюк	усеагульная геаграфія
Рыгор Багаяўленскі	руская мова, лацінская мова
Аляксандр Шчорс	англійская мова, нямецкая мова
Курт Штэрн	англійская мова, нямецкая мова
Вікторыя Доўгая	пластыка
Пятро Мірановіч	маляванне
1933/34 гг.	
Юлій Брач	латышская мова, геаграфія і гісторыя Латвіі
Язэп Клагіш	этыка, псіхалогія, беларуская мова, геаграфія Беларусі, усеагульная гісторыя

Кастусь Езавітаў	беларуская мова
Рыгор Багаяўленскі	руская мова, лацінская мова, псіхалогія, логіка
Сцяпан Сіцько	руская мова, усеагульная гісторыя
Якуб Кастылюк	усеагульная геаграфія
Франц Клагіш	матэматыка, касмаграфія
Аляксандр Родзька	матэматыка
Казімір Мяжэцкі	фізіка, прыродазнаўства, справаводства
Аляксандр Шчорс	хімія
Пятро Мірановіч	маляванне і гісторыя мастацтва
Міхаіл Грыўскі	спевы
Віктрыя Доўгая	пластыка для дзяўчат
Азоліньш	гімнастыка
Адольф Шліпс	нямецкая мова
Ніна Швангерадзэ	англійская мова

Крыніца: LVVA, 3175 f., 1 ap., 1 l., 1, 6,10, 34 lpp.; LVVA, 1632 f., 2 ap., 499 l., 94 lp.

Сярод настаўнікаў пераважалі беларусы, але ў гімназіі працавалі таксама латышы, немцы і рускія. Шматнацыянальны педагагічны склад гімназіі быў калектывам прафесіяналаў. У ліку настаўнікаў знаходзіліся дасведчаныя педагогі і грамадскія дзеячы са шматгадовым стажам. Характэрнай рысай настаўніцтва гімназіі была наяўнасць студэнтаў і выпускнікоў Латвійскага ўніверсітэта (П. Журкоўскі, А. Шчорс, К. Мяжэцкі, У. Мінчонак) і Латвійскай акадэміі мастацтва (П. Мірановіч). Сталічная гімназія давала беларускім педагогам магчымасць дадатковага заробку. Таму кандыдатаў на працу не бракавала. У снежні 1932 г. у педраду гімназіі звярнуўся С. Сахараў з просьбай даць яму лекцыі. Нягледзячы на тое, што К. Езавітаў выказаў гатоўнасць саступіць яму частку сваіх гадзін, просьба не была задаволеная[1417]. З аналагічнымі пытаннямі ў гімназію звярталіся іншыя настаўнікі. Некаторыя мелі досвед працы ў беларускіх школьных установах, іншыя з'яўляліся былымі настаўнікамі мясцовых рускіх гімназій[1418]. 12 студзеня 1933 г. у школьную раду гімназіі звярнуўся настаўнік матэматыкі і прыродазнаўства Аляксандр Мекш, які пісаў: "*З часу ліквідацыі Люцынскай дзяржаўнай беларускай гімназіі я нідзе не магу атрымаць ніякай пасады, нават інтэлігентнага беспрацоўнага. Прашу прыняць мяне на вольныя лекцыі ў гімназіі*"[1419]. У верасні 1934 г.

[1417] LVVA, 3175 f., 1 ap., 8 l., 14 lp.
[1418] LVVA, 3175 f., 1 ap., 9 l., 19 lp.
[1419] LVVA, 3175 f., 1 ap., 9 l., 38 lp.

да кіраўніка школы звярнуўся беспрацоўны настаўнік С. Казека. Ён прасіў узяць яго ў гімназію на пасаду педагога[1420].

Першае пасяджэнне педагагічнай рады гімназіі адбылося 1 верасня 1929 г.[1421] Вядома як выглядаў яе склад у 1933/34 гг.: А. Родзька (старшыня), К. Езавітаў, С. Сіцько, Я. Кастылюк, Я. Клагіш, Ю. Брач, Ф. Клагіш, А. Шліпс, Н. Швангерадзэ і В. Доўгая[1422]. Тым часам у склад школьнай рады ўваходзілі як прадстаўнікі настаўніцтва, так і бацькі. Пасаду сакратара працяглы час займаў К. Езавітаў[1423].

У першы год існавання ў гімназіі быў толькі адзін клас, які наведвала 19 вучняў. З цягам часу іх колькасць расла: у 1931/32 гг. у трох класах было 54 вучні, а ў 1932/33 гг. быў створаны апошні, чацвёрты клас. У 1933/34 гг. гімназіі налічвалася 69 вучняў[1424]. Паводле іншых крыніц, у школе ў гэты час было 70 вучняў[1425]. У 1932/33 гг. у гімназіі адбыўся першы выпуск[1426]. Урачыстасць прайшла 19 чэрвеня 1933 г., дыпломы аб сярэдняй асвеце атрымала 11 выпускнікоў[1427].

Спачатку гімназія існавала як сярэдняя школа 1-га тыпу (з вывучэннем лацінскай і нямецкай мовы). Аднак першыя гады існавання гімназіі паказалі, што вучні неахвотна наведвалі заняткі па лаціне. 4 лістапада 1931 г. школьная рада пастанавіла змяніць профіль. Паколькі большасць вучняў не мела намеру пасля гімназіі паступаць у ВНУ, было вырашана скараціць колькасць гадзін латышскай мовы. Замест гэтага прапанавалі ўвесці заняткі па англійскай мове, а таксама абавязковы іспыт па рускай[1428]. 25 кастрычніка 1931 г. педрада гімназіі на прапанову А. Родзькі прыняла рашэнне падзяліць гімназію на два аддзяленні: 1-га (з лацінай) і 2-га (з рускай і нямецкай мовамі) тыпу[1429]. 7 лістапада 1931 г. педрада вырашыла, у сувязі з пераносам гімназіі са Старога Горада на Маскоўскі Фарштат, змяніць статут гімназіі, каб можна было прымаць вучняў старэйшага веку. Бо ў новым раёне быў адпаведны беларускі кантынгент[1430]. Асаблівасцю сталічнай гімназіі было тое, што яшчэ ў 1933 г. матэматыку, фізіку і прыродазнаўства там вывучалі па рускіх падручніках, бо затрымалася дастаўка беларускіх[1431].

1420 LVVA, 3175 f., 1 ap., 9 l., 14, 26 lpp.

1421 LVVA, 3175 f., 1 ap., 1 l., 1 lp.

1422 *У Латвіі*, "Родны край" № 19 ад 16 верасня 1933 г., с. 5.

1423 LVVA, 3175 f., 1 apr., 4 l., 20 lp.

1424 LVVA, 2125 f., 5 ap., 31 l., 2 lp.; *Хроніка беларускага жыцьця у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 2(12), с. 177.

1425 LVVA, 2125 f., 5 ap., 33 l., 3 lp.

1426 LVVA, 2125 f., 5 ap., 255 l., 93, 94 lpp.

1427 *У Латвіі*, "Родны край" № 3 ад 24 чэрвеня 1933 г., с. 4.

1428 LVVA, 3175 f., 1 ap., 4 l., 3 lp.

1429 LVVA, 2125 f., 5 ap., 255 l., 79 lp.

1430 LVVA, 2125 f., 5 ap., 255 l., 80 lp.

1431 LVVA, 2125 f., 5 ap., 91 l., 93 lp.

Абітурыентамі гімназіі маглі стаць юнакі і дзяўчаты – жыхары латвійскай сталіцы, якія мелі поўную пачатковую асвету. Вучні паходзілі з незаможных рабочых сем'яў. Бацькі, якія жадалі, каб іх дзеці наведвалі школу, мусілі звярнуцца да кіраўніка гімназіі з наступнай заявай: "*Лічачы сябе беларусам/беларускай і жадаючы вучыць сваіх дзяцей на сваёй роднай мове, прашу прыняць майго сына/дачку ў (...) класу кіруемай Вамі 2-й Рыжскай Мястовай Беларускай асноўнай школы. Усе весткі аб маёй сямейцы да гэтага далучаюцца*"[1432].

Большасць кандыдатаў у гімназію складалі выпускнікі сталічных рускіх і польскіх, а таксама беларускіх пачатковых школ. Часам паступалі і выхадцы з Латгаліі, у тым ліку былыя вучні тамтэйшых беларускіх пачатковых школ. Аналіз асабовых спраў вучняў дае ўяўленне пра матывы, якія імі кіравалі падчас паступлення ў беларускую гімназію. Вучань Язэп Пушкоўскі пісаў: "*Калі я даведаўся, што ў Рызе знаходзіцца беларуская гімназія, у мяне прабудзілась нутранае жаданне пазнаёміцца з роднай мовай, якая дужа і дужа ў мяне храмала, ад розных уплываў. Па сканчэнню ўсіх спраў абавязкова павінен ехаць у сваю мясцовасць, Рунданы, дзеля ўпарадкавання сваёй пасады, а галоўнае, каб папрацаваць у пользу сваіх беларусаў-сялян, над каторымі здзекуюцца як палякі, стараясь апалячыць іх, з другага боку стараверы*"[1433]. 30 ліпеня 1933 г. Ян Раманаў наступным чынам тлумачыў жаданне паступіць у гімназію: "*Да вучэння ў мяне вельмі вялікая ахвота, але каб вучыцца ў гімназіі, у мяне няма сродак. Калі мне было адзінаццаць лет памёр мой бацька, а цераз два гады і маці: застаўся я адзін сіратой. Блізкіх родных у мяне не было, каб мне даць дапамогу, а пражываў я з свайго заробку. Зямлі таксама няма. Калі ж я задумаў паступіць у гімназію – мне адказалі, што патрэбна плаціць у год сто латаў, чаго я, зразумела, не мог рабіць пры сваім маленькім заработку. Але зараз, даведаўшыся аб вашай гімназіі, у мяне зноў з'явілася надзея на святло веды. І вось калі Вы, паважаная педагагічная рада, можаце мяне прыняць безграшова вучыцца і даць маленькую дапамогу – у выглядзе кутка для прытулку, то зрабіце мне вялікую ўслугу, чаго я ў будучыні ніколі не забуду і ўсімі сіламі буду стараццца ў вучэнні апраўдаць Вашыя надзеі*"[1434].

Гісторыя ведае выпадкі, калі ў гімназію траплялі былыя вучні Даўгаўпілскай беларускай гімназіі. У 1932 г. у 4-ты клас гімназіі прынялі дачку С. Сахарава – Ірыну, якая да гэтага вучылася ў Даўгаўпілсе. Пасля выхаду на пенсію беларускі дзеяч пераехаў у Рыгу, таму паклапаціўся, каб яго дачка атрымала беларускамоўную асвету[1435]. У Рызе апынуўся яшчэ адзін вучань Даўгаўпілскай

[1432] LVVA, 2067 f., 1 ap., 364 l., 537 lp.
[1433] LVVA, 3175 f., 1 ap., 14 l., 66 lp.
[1434] LVVA, 3175 f., 1 ap., 14 l., 150 lp.
[1435] LVVA, 3175 f., 1 ap., 15 l., 4 lp.

беларускай гімназіі Аляксандр Салдашынскі[1436]. Кіраўніцтва гімназіі прагназавала, што пасля ліквідацыі Даўгаўпілскай беларускай гімназіі ў сталіцы з'явіцца больш беларускай моладзі з Латгаліі. Школьная рада нават збіралася зарэзерваваць для выхадцаў адтуль пакой у інтэрнаце[1437]. Назіраўся таксама рух у адваротны бок – з Рыгі ў Даўгаўпілс. Напрыклад, у лістападзе 1932 г. вучаніцы Юзэфа Пашкевіч і Таіса Андрушонак былі пераведзены з Рыгі ў Даўгаўпілскую беларускую гімназію[1438].

Хоць гімназія лічылася беларускай, у яе прымалі прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей. Беларуская гімназіі прываблівала невысокім коштам навучання, што рабіла яе больш даступнай у параўнанні з іншымі сярэднімі школамі сталіцы. У выпадку небеларусаў у заяве да дырэкцыі выкрэсліваліся словы "*беларускай*" *і* "*нацыянальнае выхаванне*"[1439]. Паводле афіцыйных звестак, у 1931/32 гг. у школе вучыліся 4 рускія і 1 эстонец[1440]. У рэальнасці колькасць небеларусаў была большай. Паколькі існавала фармальная забарона прымаць у гімназію прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей, апошнія запісваліся беларусамі. З архіўных дакументаў вынікае, што ў значнай ступені гэта тычылася габрэяў. 6 верасня 1932 г. жыхарка Рыгі Рыва Банк звярнулася да дырэкцыі гімназіі з просьбай прыняць яе дачку Зэльду-Раю, якая раней наведвала Рыжскую гарадскую габрэйскую гімназію. У заяве яна пазначыла сваю нацыянальнасць як "жыдоўскую", таму сакратар школьнай рады К. Езавітаў яе просьбу разгледзеў адмоўна[1441]. Тады жанчына яшчэ раз звярнулася ў педраду гімназіі з просьбай прыняць яе дачку, аргументуючы тым, што і маці, і дачка належаць да беларускай нацыянальнасці[1442]. У выніку вучаніцу прынялі ў гімназію як беларуску. 31 жніўня 1932 г. з заявай аб прыняцці ў гімназію дачкі звярнуўся Янкель Браўэр, які дэкларааваў беларускую нацыянальнасць. Кастусь Езавітаў пагадзіўся прыняць, але з умовай, што дачка здасць іспыт па беларускай мове. Акрамя таго, бацька мусіў далучыць да заявы асобную дэкларацыю, што ён і дачка беларусы паводле нацыянальнасці[1443]. Грамадзянка Хая Брушцін у заяве аб прыняцці дачкі ў гімназію пісала: "*Уверяю, что моя дочь Гинда является белорусской по национальности, и поэтому желаю, чтобы она училась в Рижской белорусской гимназии*"[1444]. Цікавым з'яўляецца выпадак жыхара Рыгі Абрама Каплана. 3 верасня 1932 г.

[1436] LVVA, 3175 f., 1 ap., 15 l., 9 lp.
[1437] LVVA, 3175 f., 1 ap., 1 l., 43 lp.
[1438] LVVA, 3175 f., 1 ap., 1 l., 49 lp.
[1439] LVVA, 3175 f., 1 ap., 11 l., 1, 7 lp.
[1440] LVVA, 2125 f., 5 ap., 90 l., 11 lp.
[1441] LVVA, 3175 f., 1 ap., 11 l., 55 lp.
[1442] LVVA, 3175 f., 1 ap., 11 l., 56 lp.
[1443] LVVA, 3175 f., 1 ap., 11 l., 129, 131 lpp.
[1444] LVVA, 3175 f., 1 ap., 11 l., 133, 135 lpp.

ён напісаў заяву аб прыняцці ў гімназію сына Мозуса. У абгрунтаванні свайго рашэння ён адзначаў: "*Настоящим довожу до сведения уважаемой дирекции белорусской гимназии, что моя покойная жена была родом из Белоруссии, и я считаю своего сына Мозуса принадлежащим к белорусской нации и желаю, что-бы он посещал белорусскую гимназию*"[1445].

Ускосным сведчаннем прысутнасці ў мурах гімназіі рускіх з'яўляецца факт, што сярод вучняў траплялiся былыя выхаванцы рускіх школ[1446]. Вучнем гімназіі быў рускі Канстанцін Чарамухін, выхаванец рускай школы ў Рызе і супрацоўнік газеты "Сегодня". Ён нарадзіўся ў Царскім Сяле, але ў 1922 г. яго маці выйшла замуж за жыхара Даўгаўпілса і пераехала з Расіі і Латвію. Пасля навучання ў беларускай гімназіі юнак добра авалодаў пісьмовай беларускай мовай. У лісце дырэктару гімназіі (24 траўня 1933 г.) ён адзначаў, што ў рускую гімназію паступіць не змог з фінансавых прычын. Вучань выказваў удзячнасць за магчымасць атрымаць асвету ў беларускай гімназіі і запэўніваў, што заўсёды будзе гэта памятаць[1447]. Некаторыя вучні-небеларусы падчас навучання ў гімназіі здолелі прасякнуцца беларускім духам. Заслугоўвае ўвагі выпадак Валянціна Нойланда, які паходзіў з сям'і аблатышанага немца і рускай. Яго дзяцінства мінула ў Омску. У 1931 г. юнак паступіў у гімназію, якую скончыў у 1933 г. За час навучання ён авалодаў беларускай мовай. Жаданне вучыцца ў беларускай гімназіі ён тлумачыў наступным чынам: "*Бываючы ў Латгальскім Прадмесці, я пазнаёміўся з беларускімі дзеячамі і з самім рухам. Трэба адзначыць, што я ўжо, едучы праз Менскую і Віцебскую губерню, вельмі сімпатызаваў беласвітачным мужыкам-беларусам. Гэтым чынам я задумаў прыняць удзел у беларускай культурна-асветнай працы, перш уступіўшы ў Рыжскую Беларускую Гімназію Таварыства Беларускіх Вучыцялёў (...) Па бацьку мушу лічыць сябе латышом, але вельмі сімпатызую руху беларускаму і лічу сябе прычасным духова да беларусаў*"[1448]. Іншы вучань – латыш, які скончыў гімназію, пісаў: "*Думаю шмат працаваць на шляху латышска-беларускага збліжэння. І шчыра веру ў тое, што прыйдзе пара, калі і беларускі народ будзе вольны, каб ён аб'еднае ўсі беларускія землі і сам будзе панаваць у сваёй старонцы. Гэта новае гаспадарства будзе ў вельмі добрых адносінах*"[1449].

На адзнакі вучняў уплывала іх цяжкае матэрыяльнае становішча і патрэба спалучаць вучобу з працай. 13 верасня 1932 г. кіраўнік гімназіі інфармаваў, што за непаспяховасць на другі год былі пакінутыя 13 вучняў, пераведзеныя

[1445] LVVA, 3175 f., 1 ap., 13 l., 8 lp.
[1446] LVVA, 2125 f., 5 ap., 255 l., 109 lp.
[1447] LVVA, 3175 f., 1 ap., 12 l., 1 lp.
[1448] LVVA, 3175 f., 1 ap., 14 l., 8 lp.
[1449] LVVA, 3175 f., 1 ap., 15 l., 70 lp.

без іспытаў – 11, дапушчаныя да пераводных іспытаў – 21[1450]. Частымі былі звароты вучняў у дырэкцыю з просьбай пра адтэрміноўку іспытаў або паўторныя іспыты. Напрыклад, 4 снежня 1933 г. вучаніца 3-га класа Вера Данілевіч прасіла дапусціць яе паўторна да іспыту па беларускай мове. Вучаніца тлумачыла, што пасля хваробы выйшла на працу і была вымушана рабіць удвая больш, таму не мела часу падрыхтавацца і не здала прадмет з першага разу[1451]. Вучань Аляксандр Салдашынскі 5 лютага 1934 г. прасіў школьную раду дапамагчы яму заплаціць за здыманую кватэру, бо ён паходзіў з вялікай сям'і з 9 чалавек, і меў хворую маці, якая не магла яму дапамагчы[1452].

Асноўнай крыніцай фінансавання гімназіі былі дзяржаўныя датацыі, якія вылучаліся ТБНЛ праз пасярэдніцтва Беларускага школьнага аддзела. Напрыклад, 26 ліпеня 1929 г. Рада БША прызначыла на патрэбы школы 1 200 латаў[1453]. Акрамя таго, гімназія магла разлічваць на дапамогу сталічнага самакіравання. Так, у 1932 г. гарадскія ўлады ахвяравалі на карысць школы 8 тыс. латаў[1454].

Калектыў настаўнікаў гімназіі рупіўся, каб у яе мурах панаваў беларускі нацыянальны дух. Некаторыя вучні належалі да ТБМЛ[1455]. 30 ліпеня 1930 г. кіраўніцтва школы звярнулася да кіраўніцтва Таварыства беларускага тэатру ў Латвіі з просьбай вылучыць 300 латаў на пабудову сцэны. Аднак сродкаў не знайшлося[1456]. Тым не менш, на пачатку 1930-х гг. аматарскі тэатральны калектыў гімназіі паставіў некалькі дабрачынных спектакляў: *На вёсцы* Ф. Аляхновіча і *На Полацкім замчышчы* В. Сахаравай[1457]. 16 красавіка 1932 г. К. Езавітаў прачытаў у гімназіі публічную лекцыю *Асьвета ў Латвіі і на Беларусі*. Пасля выступілі з музычнай праграмай В. Бедарава (спеў) і В. Бароўская-Пігулеўская (піяніна)[1458].

Педагогі спрабавалі стварыць у гімназіі бібліятэку дзеля лепшага азнаямлення вучняў з беларускай літаратурай[1459]. 30 верасня 1932 г. з ініцыятывы К. Езавітава педрада ўхваліла зварот да Культурнага фонда Латвіі, БША, беларускіх арганізацый і бацькоў вучняў з заклікам ахвяраваць кнігі. У хуткім

[1450] LVVA, 2125 f., 5 ap., 90 l., 11 lp.

[1451] LVVA, 3175 f., 1 ap., 12 l., 33 lp.

[1452] LVVA, 3175 f., 1 ap., 15 l., 9 lp.

[1453] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 8 lp.

[1454] *Хроніка беларускага жыцьця у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 2(12), с. 177.

[1455] LVVA, 3175 f., 1 ap., 8 l., 39 lp.

[1456] LVVA, 1747 f., 1 ap., 19 l., 184 lp.

[1457] LVVA, 3175 f., 1 ap., 1 l., 45, 47 lpp.

[1458] *Хроніка беларускага жыцьця ў Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, 1(11), с. 160; *Хроніка беларускага жыцьця у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 2(12), с. 176.

[1459] LVVA, 3175 f., 1 ap., 1 l., 43 lp.

часе ў гімназіі з'явілася бібліятэка, загадчыкам якой стаў П. Масальскі[1460]. Адначасова педрада звярнулася ў аддзел асветы рыжскага гарадскога самакіравання і 3-ю гарадскую бібліятэку з просьбай стварыць у ёй беларускі аддзел. Аднак лёс гэтай ініцыятывы невядомы[1461].

На пасяджэнні 30 верасня 1932 г. педрада прыняла пастанову пра далучэнне гімназіі да БНКТЛ[1462]. Настаўнікі і вучні ўдзельнічалі ў культурнай працы. 29 кастрычніка 1932 г. гімназія зладзіла ўрачыстасць з нагоды 50-годдзя нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа, падчас якой К. Езавітаў прачытаў рэферат *Янка Купала і Якуб Колас у беларускім адраджэнні*, а вучні дэкламавалі вершы і спявалі песні. Дырэктар працытаваў віншавальныя тэлеграмы ад праф. Яна Галомбэка з Варшавы, Таварыства беларускай школы ў Вільні, іншых асоб і ўстаноў. Пасля ўрачыстасці прысутныя праспявалі *Не пагаснуць зоркі ў небе*[1463]. 21 снежня 1932 г. педрада гімназіі вырашыла зладзіць вечарыну ў гонар 50-годдзя Уладзіслава Галубка і 80-годдзя беларускага тэатра. У сувязі з гэтым К. Езавітаву была даручана падрыхтоўка лекцыі, прысвечанай У. Галубку[1464].

25 сакавіка 1933 г. у гімназіі прайшло святкаванне 25-х угодкаў абвяшчэння БНР, арганізатарамі якога выступілі ТБНЛ, ТБМ і БНКТЛ[1465]. Урачыстасць было спалучана з калектыўным юбілеем васьмі беларускіх настаўнікаў – М. Дзямідава, М. Іванова, Я. Кастылюка, Р. Плыгаўкі, А. Родзькі, С. Сіцько, С. Сахарава, А. Хруцкага. Юбіляры атрымалі ад К. Езавітава жэтоны з выявай Францыска Скарыны[1466]. 28 красавіка 1933 г. з прапановы К. Езавітава, у гонар 415-годдзя выдання Бібліі на старабеларускай мове, педагагічная рада прыняла зварот да Беларускага школьнага аддзела з просьбай надаць гімназіі імя Францыска Скарыны (*Рыжская прыватная беларуская імя Францыска Скарыны гімназія ТБНЛ – Latvijas Baltkrievu skolotaju b-bas Franciska Skarinasvarde privata baltkrievu ginnazija Riga*) з правам выкарыстоўваць герб Скарыны на пячатках, штампах і вучнёўскіх гербах[1467]. У якасці абгрунтавання надання патранату адзначалася: "Каб ушанаваць памяць гэтага беларускага дзеяча"[1468]. Прысутныя зацвердзілі праект значка для

[1460] LVVA, 3175 f., 1 ap., 1 l., 50 lp.

[1461] LVVA, 3175 f., 1 ap., 1 l., 43 lp.

[1462] LVVA, 3175 f., 1 ap., 1 l., 43 lp.

[1463] LVVA, 3175 f., 1 ap., 1 l., 45, 47 lpp.

[1464] LVVA, 3175 f., 1 ap., 8 l., 14 lp.

[1465] Яз. Клагіш, *Юбілейнае сьвяткаваньне 25 сакавіка ў Рызе*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 3(20), с. 299.

[1466] *З жыцьця Т-ва Беларускіх вучыцялёў у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 4(21), с. 320.

[1467] LVVA, 3175 f., 1 ap., 8 l., 30 lp.

[1468] LVVA, 3175 f., 1 ap., 4 l., 11 lp.

выпускнікоў у выглядзе тарчы беларускіх нацыянальных колераў з выявай герба Скарыны, а ўнізе надпісам-скаротам "РБПГ"[1469]. 16 студзеня 1933 г. педрада абвясціла конкурс на значок для абітурыентаў гімназіі, які павінен быў змяшчаць наступныя элементы: назву гімназіі, выяву герба "Пагоня" ці герба Францыска Скарыны або спалучэнне абодвух геральдычных знакаў[1470]. У чэрвені 1933 г. міністр асветы не дазволіў надаць гімназіі імя Скарыны, але зацвердзіў вышэйзгаданы значок для выпускнікоў[1471].

Нягледзячы на тое, што Рыжская прыватная беларуская гімназія была створана толькі ў 1929 г., з яе муроў выйшла некалькі маладзёнаў, якія потым удзельнічалі ў грамадска-культурным жыцці Латвіі. Сярод іх належыць узгадаць паэта і грамадскага дзеяча Пятра Масальскага і Ірыну Сахараву, дачку С. Сахарава[1472]. Іншы выхаванец гімназіі Аляксандр Булат у 1936 г. здабыў званне чэмпіёна краіны па фехтаванні[1473].

Звернемся да колькаснага складу беларускіх гімназій. Захаваліся не толькі лічбы вучняў асобных школ, але і ў суадносінах да колькасці вучняў у школах іншых нацыянальных меншасцей.

Табліца 43. Сярэднія школы нацыянальных меншасцей у Латвіі ў 1929/30 гг.

Нацыянальнасць	Колькасць школ	Лічба вучняў
Рускія	14	1 956
Беларусы	2	108
Немцы	11	2 205
Габрэі	22	2 617
Палякі	3	337
Літоўцы	1	71
Мяшаныя школы	2	221

Крыніца: AAN, sygn.: MSZ, t. 5290, Raport pt. Mniejszości narodowe na Łotwie, 1 III 1929 r.

[1469] LVVA, 3175 f., 1 ap., 8 l., 36 lp.

[1470] LVVA, 3175 f., 1 ap., 8 l., 17 lp.

[1471] LVVA, 3175 f., 1 ap., 8 l., 30 lp.; *Хроніка беларускага жыцьця у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 6(23), с. 354.

[1472] LVVA, 3175 f., 1 ap., 8 l., 33 lp.

[1473] Э. Екабсонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [в:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 70.

Табліца 44. Колькасць беларусаў – вучняў сярэдніх школ Латвіі ў 1925–1935 гг.

Навучальны год	Вучні
1925/26	150
1926/27	106
1927/28	108
1928/29	108
1929/30	127
1930/31	134
1931/32	141
1932/33	156
1033/34	174
1934/35	127

Крыніца: AAN, sygn.: MSZ, t. 5290.

На падставе апошняй табліцы можна сцвярджаць, што ў разгляданы час колькасць латвійскіх беларусаў, якія вучыліся ў сярэдніх школах, вагалася ад 106 (у 1926/27 гг.) да 174 чал. (у 1933/34 гг.).

Большасць з іх атрымлівала сярэднюю асвету ў беларускіх гімназіях. У 1925/26 гг. 88% беларусаў – вучняў сярэдніх школ складалі навучэнцы беларускіх гімназій. У 1930/31 гг. гэты адсотак складаў 75,7%, у 1930/31 гг. – амаль 76%. Гэтыя паказнікі былі лепшыя, чым у палякаў, літоўцаў і габрэяў, але горшыя, чым у немцаў і рускіх[1474].

Аднак не ўсе латвійскія беларусы здабывалі сярэднюю асвету ў сваіх нацыянальных школах. Лічба беларусаў сярод вучняў сярэдніх школ Латвіі перавышала колькасць абітурыентаў дзвюх беларускіх гімназій. Гэта азначае, што частка маладых беларусаў наведвала гімназіі іншых нацыянальнасцей – асабліва латышскія сярэднія школы. Дзве беларускія гімназіі не былі ў стане забяспечыць запатрабаванне ўсіх беларусаў на сярэднюю адукацыі.

Большасць навучэнцаў беларускіх сярэдніх школ складалі прадстаўнікі латгальскай вёскі – ажно 83% у сярэдзіне 1920-х г. Пасля адкрыцця гімназіі ў Рызе павялічыўся адсотак гараджан, але па-ранейшаму колькасна пераважала вясковая моладзь[1475].

Ацэньваючы плён працы беларускіх гімназій, належыць падкрэсліць, што яны былі кузняй мясцовай беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі. Беларускія дзеячы ў Латвіі з гонарам пісалі, што за 10 гадоў ім удалося выхаваць "хоць

[1474] J. Albin, *Polski ruch narodowy na Łotwie w latach 1919–1940*, Wrocław 1993, s. 125.

[1475] LVVA, 2125 f., 5 ap., 77 l., 15 lp.

невялічкія кадры свядомае моладзі, якая ўжо можа стаць на працу поплеч са старэйшым пакаленнем”[1476]. Цяжка не пагадзіцца з гэтым. Разам з тым, варта памятаць, што большасць выхаванцаў беларускіх гімназій не працягнула адукацыі. З матэрыяльных прычын толькі нязначная іх частка магла дазволіць сабе пайсці ў ВНУ.

* * *

Падсумоўваючы дзейнасць беларускай школьнай справы ў Латвіі, належыць падкрэсліць, што яно было адным з найбольш прыкметных эфектаў культурна-асветнай актыўнасці беларускай меншасці. Пра яго эфектыўнасць сведчыць колькасць выпускнікоў беларускіх школ у перыяд існавання школьнай аўтаноміі. З нашых падлікаў вынікае, што ў гэты час няпоўную пачатковую асвету ў родных школах атрымалі 1 140 чал., поўную пачатковую – 501 і сярэднюю – 165. Больш падрабязныя звесткі ўтрымлівае табліца.

Табліца 45. Колькасць выпускнікоў беларускіх школ у 1921–1933 гг.

Навучальны год	4 кл. школы	6 кл. школы	Гімназіі
1921/22	92	-	-
1922/23	78	22	14
1923/24	106	7	11
1924/25	86	5	8
1925/26	83	28	25
1926/27	55	19	21
1927/28	109	48	13
1928/29	99	48	10
1929/30	127	56	15
1930/31	70	57	10
1931/32	136	119	13
1932/33	99	92	25
Разам	1 140	501	165

Крыніца: LVVA, 2125 f., 5 ap., 333 l., 60 lp.

[1476] С. Сахараў, *Бацькі і дзеці (Думкі з поваду аднаго рэфэрату)*, “Беларуская школа ў Латвіі” 1933, № 7(24), с. 359.

РАЗДЗЕЛ IV

У свеце палітыкі і міжнацыянальных адносін

Латвійскія беларусы і Савецкая Беларусь

Пачынаючы разгляд стаўлення латвійскіх беларусаў да Савецкай Беларусі, належыць адзначыць, што значнай частцы беларускай меншасці ў міжваеннай Латвіі – як прадстаўнікам інтэлігенцыі, так і "нізам" – былі ўласцівыя прасавецкія настроі. Гэта пацвярджаюць як савецкія, так і латвійскія крыніцы. Сярод галоўных прычын такіх сімпатый беларускіх мас Эрык Екабсонс пералічвае нізкі ўзровень адукацыі і незаможнасць беларускага сялянства, няведанне савецкай рэчаіснасці, вынікі русіфікацыі і наяўнасць сваякоў у Беларускай ССР. Некаторыя незаможныя сяляне-беларусы шукаючы шляхоў палепшыць дабрабыт, былі схільныя верыць камуністычнай агітацыі з усходу. Невыпадкова беларуская частка Латгаліі лічылася рэгіёнам, найбольш падатным на камуністычныя ўплывы. Падобна выглядала сітуацыя сярод прадстаўнікоў інтэтігенцыі, што яскрава пацвердзілі вынікі следства падчас беларускага працэсу. Паліцэйскае следства паказала, што беларускі нацыянальны актыў Латвіі гуртаваўся вакол трох асяродкаў кіраваных: 1) К. Езавітавым і У. Пігулеўскім, якія выступалі за федэрацыю Беларусі з Савецкай Расіяй, 2) А. Якубецкім і П. Мядзёлкай-Грыб, якія трымаліся ідэі незалежнасці Беларусі, але з захаваннем шчыльнага супрацоўніцтва з Расіяй, 3) І. Краскоўскім, які стаяў на пазіцыі поўнай незалежнасці Беларусі, але не адмаўляўся ад супрацоўніцтва з БССР у галіне культуры. Як бачна, ніводная з груп не цуралася "чырвонага" Менска[1].

---

[1] Э. Екабсонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [у:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 53.

Усе пералічаныя фракцыі ў той ці іншай ступені бачылі сваю будучыню ў сувязі з гістарычнай радзімай – Беларуссю. Варта прывесці словы П. Мядзёлкі-Грыб, якія даюць уяўленне, як успрымалася савецкая рэчаіснасць вачыма некаторых латвійскіх беларусаў: "*З Усходу даходзілі да нас вельмі скупыя весткі. Савецкія газеты да нас не траплялі, а ў рускіх газетах, асабліва ў дзвінскай, змяшчаліся такія неверагодныя паклёпніцкія артыкулы аб жыцці ў Краіне Саветаў, што ніхто ім не верыў. Калі часам на чыгуначнай станцыі затрымліваўся вагон з Савецкай Беларусі і з надпісам на беларускай мове, нашы вучні, ды і мы разам з імі, беглі на станцыю ў тайнай надзеі спаткаць якога-небудзь чыгуначніка ці пасажыра з Краіны Саветаў і пагутарыць з ім. Карабочак запалак з этыкеткай фабрыкі з Савецкай Беларусі пераходзіў з рук у рукі, і кожны радасна вітаў гэтага маленькага пасланца. А калі трапіў у нашы рукі адзін нумар часопіса 'Полымя', дык мы ледзь не біліся за яго*"[2].

Істотным чыннікам, які тлумачыў прыхільнасць латвійскай беларускай інтэлігенцыі да Савецкай Беларусі, з'яўлялася "чырвоная беларусізацыя", якая там адбывалася ў 1920-я гг. Поспехі палітыкі каранізацыі не маглі не прывабліваць беларускіх нацыянальных дзеячаў у Латвіі[3]. Іх стаўленне да БССР належыць разглядаць у агульным кантэксце падзей і тэндэнцый, уласцівых тагачаснаму беларускаму нацыянальнаму лагеру. У 1920-я гг. на "чырвоную" ліхаманку захварэла шмат беларускіх адраджэнцаў. Плён беларусізацыі рабіў уражанне нават на тых, хто яшчэ нядаўна варожа ўспрымаў бальшавіцкую ўладу. Уплыў на стварэнне станоўчага вобразу БССРаўскай рэчаіснасці мелі поспехі НЭПу, а таксама абвешчаная ў 1923 г. амністыя для былых удзельнікаў антысавецкага руху. Значная частка беларускіх незалежнікаў разглядала НЭП і беларусізацыю як стабільны курс савецкай палітыкі і лічыла яе праявай самастойнасці ўладаў БССР. Многія спадзяваліся, што неўзабаве пачнецца дэмакратызацыя савецкага рэжыму. Ва ўмовах адсутнасці нацыянальнай дзяржаўнасці БССР разглядалася як своеасаблівы "П'емонт", якому адводзілася роля збіральніка беларускіх зямель і ўмацавання нацыянальнай свядомасці іх жыхароў. Частка беларускіх дзеячаў не здолела ўстрымацца ад ілюзіі, што "чырвоны" Менск з'яўляецца ўвасабленнем беларускіх нацыянальна-культурных і дзяржаўных памкненняў. Спрыяла гэтаму і тое, што сацыялізм не быў чужым беларускаму нацыянальнаму руху пачатку XX ст. Многія беларускія дзеячы трымаліся левых поглядаў, у тым ліку і лідары латвійскіх беларусаў. Дзяржаўная ідэалогія БССР успрымалася як

---

[2] П. Мядзёлка, *Сцежкамі жыцця*, Менск 2018, с. 328.

[3] Шырэй гл.: J. Grzybowski, *Савецкая рэчаіснасць на бачынах беларускай газеты ў Латвіі "Голас беларуса" (1925–1929 г.)* [у:] *«Światła masz tyle w sobie…". Ze studiów wschodniosłowiańskich. Księga pamiątkowa dedykowana Profesorowi Aleksandrowi Barszczewskiemu w osiemdziesiątą piątą rocznicę urodzin*, red. M. Kaczmarczyk, A. Nowacki, M. Sidor, B. Siwek, Lublin 2015, s. 207–222.

праява сацыялістычнай ідэі, ані чужой, ані варожай большасці беларускіх адраджэнцаў. Прасавецкія настроі ўзмацняла міжнародная сітуацыя і адсутнасць добрай альтэрнатывы для беларускай справы. У прыватнасці, сімпатыі да БССР узмацніла расчараванне Версальскай дамовай, архітэктары якой захоўвалі абыякавасць да пастулатаў беларускіх незалежнікаў. У вачах адраджэнцаў савецкая беларусізацыя кантраставала з тым, што адбылося пасля 1921 года: ганебным для беларусаў Рыжскім пагадненнем, адсутнасцю зацікаўлення беларускім пытаннем з боку заходніх дзяржаў і дыскрымінацыйнай палітыкай польскіх улад у Заходняй Беларусі[4].

Аднак не толькі латвійскія беларусы праяўлялі цікавасць да БССР. З Менска ўважліва сачылі за падзеямі і настроямі беларусаў замежжа, у тым ліку ў Латвіі. Палітыка менскіх бальшавікоў у дачыненні да латвійскіх беларусаў упісвалася ў агульную тагачасную лінію савецкага кіраўніцтва, скіраваную на кантроль і раскладанне беларускай эміграцыі, каб не дапусціць стварэння за межамі БССР канкурэнтнага палітычнага цэнтра. У Савецкай Беларусі не маглі не лічыцца з прысутнасцю беларускага нацыянальнага актыву ў Латвіі і яго дасягненнямі на культурна-асветнай ніве. Партыйныя органы Беларускай ССР імкнуліся падначаліць беларускі нацыянальны рух у Латвіі савецкім інтарэсам, каб праз яго пашыраць камуністычныя ўплывы. Галоўныя мэты бальшавікоў у гэтым пытанні яскрава адлюстроўваюць тэзісы дакладу "Беларускі рух за кардонам", агучанага на закрытай нарадзе Бюро ЦК КП(б)Б ад 16 кастрычніка 1925 г.: "*Наша политика в общем во всех этих странах* [маюцца на ўвазе – Польшча, Чэхаславакія, Літва і Латвія – ЕГ] *должна заключаться в развитии национального белорусского движения, охвата его и превращения в революционное движение под лозунгами объединения белорусского народа, создания единой Белорусии и установления в ней рабоче-крестьянской Советской власти*"[5]. За кантакты з беларускім актывам за межамі БССР адказвалі Народны камісарыят замежных спраў (НКЗС) і ЦК КП(б)Б. Рашэнні прыводзіліся ў выкананне па лініі савецкага дыпламатычнага прадстаўніцтва ў Рызе. Планаваннем мерапрыемстваў займалася партыйнае кіраўніцтва ў Менску, а дзяржаўныя прадстаўнікі Савецкай Беларусі трымалі непасрэдную сувязь з упаўнаважаным НКЗС пры ўрадзе БССР[6]. У дакладзе, агучаным падчас нарады ЦК КП(б)Б у Менску, падкрэслівалася, што да моманту, калі беларускія сялянскія масы будуць

[4] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., Ліст К. Езавітава да Язэпа Варонкі і Янкі Чарапука, 16 снежня 1926 г.

[5] *Знешняя палітыка Беларусі. Зборнік дакументаў і матэрыялаў. Т. 2. 1923–1927*, рэд. У. Міхнюк і інш., Менск 1999, с. 190.

[6] *Знешняя палітыка Беларусі. Зборнік дакументаў і матэрыялаў. Т. 2. 1923–1927*, рэд. У. Міхнюк і інш., Менск 1999, с. 191.

ахопленыя рэвалюцыйнымі ўплывамі, належыць "*использовать национальное белорусское движение для борьбы с правительством Латвии, направляя его в сторону сближения с БССР под лозунгом объединения с БССР*"[7]. Дзеля рэалізацыі партыйных мэтаў напрыканцы 1924 г. у Рыгу прыбыў Аляксандр Ульянаў. Становішча мясцовых беларусаў і магчымасці працы з імі ён ацэньваў наступным чынам: "*Як толькі я прыехаў у Рыгу, зараз жа быў у Паўпрэда і падрабязна даведаўся ад яго аб сваім становішчы, а таксама зразумеў, што за гэты час зроблена ў дачыненні сувязі з беларусамі. Езавітаў вызвалены пасля працэсу, які нічога, акрамя таго, што зроблена яму рэклама, не дабіўся (...) Беларусы, якія маюць тут тры паветы ў Латгаліі, маюць свае школы, культурныя таварыствы і якіясьці кааператывы, імкнуцца як бы там ні было захаваць свой нацыянальны твар. Куды скіраваць погляд? З палякамі скончана даўно. Коўна само сядзіць на бабах, застаёмся мы. І зразумела, што іх вочы скіраваныя на Менск. Палітыка латышоў, якія закрылі беларускі школьны аддзел і імкнуцца ўсяляк урэзаць сяэрэднія беларускія школы, адкрыццё латышамі ў чыста беларускіх раёнах (...) латышскіх школ – усё гэта прымушае беларусаў больш актыўна супрацьдзейнічаць "аблатышванню" краю. У апошні час латышы пачалі больш тонкую палітыку, імкнучыся знайсці сярод беларусаў больш падатлівых, гатовых паказаць сябе вернападданымі "латышскімі беларусамі" (...) Мэта Езавітава, Краскоўскага і іх сяброў – гэта паставіць у Латвіі беларускае пытанне. Пры гэтым іх канчатковай мэтай, як яны гэта заявілі, ёсць аб'яднанне Беларусі ў этнаграфічных межах*"[8].

Каб кантраляваць беларускае нацыянальнае жыццё ў Латвіі бальшавікі мусілі знайсці сярод беларускіх дзеячаў адпаведную асобу, схільную да супрацоўніцтва. Увагу савецкага кіраўніцтва прыцягнуў К. Езавітаў. З карэспандэнцыі паміж ЦК КПЗБ з прадстаўніком НКЗС СССР у Рызе вынікае, што супрацоўніцтва з беларускім дзеячам было прадметам увагі савецкіх партыйных органаў. У лісце агента "Адама" (25 красавіка 1925 г.) адзначалася, што "*Езавітава трэба будзе выкарыстаць, але звязаць дакументамі (матэрыяльнымі і іншымі) у нашых руках*"[9]. Савецкі бок лічыў, што судовы працэс спрычыніўся да ўзмацнення аўтарытэту К. Езавітава ў вачах іншых латвійскіх беларусаў. Першы кантакт К. Езавітава з савецкімі прадстаўнікамі адбыўся 22 красавіка 1925 г. у сядзібе Паўнамоцнага прадстаўніцтва СССР у Рызе. Падчас сустрэчы савецкіх прадстаўнікоў з К. Езавітавым першаму ўдалося пераканаць беларускага дзеяча падпісаць

---

[7] *Знешняя палітыка Беларусі. Зборнік дакументаў і матэрыялаў. Т. 2. 1923–1927*, рэд. У. Міхнюк і інш., Менск 1999, с. 188.

[8] Цыт. пав.: В. Бароўская, *Алесь Ульянаў: старонкі жыцця (1901 - 1937)*, Менск 2025, с. 58–59.

[9] А. Вабішчэвіч, *"Але ж шлях да свабоды старонка праложа!"* [у:] *Сыны і пасынкі Беларусі*, рэд. С. Барыс, Менск 1996, с. 330.

дакладную нататку пра стан мясцовага беларускага руху і каштарыс супрацоўніцтва. Пры гэтым аўтар (агент "Аляксандр") звяртаў увагу, што К. Езавітаў марудзіў з подпісам, але ў рэшце рэшт пагадзіўся, тлумачачы, што "*мой лёс звязаны з Вамі, што толькі з дапамогай Вашай я змагу быць тут кіраўніком беларускага нацыянальнага руху, я ўсё ўлічваю і падпішу дакумент і каштарыс*"[10]. На супрацоўніцтва з беларускім дзеячам улады ў Менску ўскладалі спадзяванні, бо менавіта ён быў піянерам беларускага жыцця ў Латвіі, меў аўтарытэт і ўплыў на суайчыннікаў. Вось якім чынам К. Езавітава характарызаваў дакладчык ЦК КП(б)Б пра беларускі рух за мяжой (16 кастрычніка 1925 г.): "*В настоящее время Езавитов очень близок к нашему Полпредству и при нашей помощи участовал с отдельным белорусским списком на выборах в латвийский сейм. До сего времени не находится под руководством Компартии Латвии и направление своей работы отчасти получает из нашего Полпредства. Созданные им на выборах комитеты приближают его к белорусским массам*"[11].

Верагодна, што да супрацоўніцтва з Менскам К. Езавітава падштурхнула складанае матэрыяльнае становішча і пошук новых крыніц фінансавання беларускай дзейнасці. Існуюць падставы меркаваць, што рашэнне К. Езавітава пра супрацоўніцтва з СССР тлумачылася агульным настроем, які панаваў пасля беларускага працэсу і патрэбамі атрымаць сродкі на існаванне беларускіх арганізацый. Разам з тым, аналіз даступных крыніц дазваляе зрабіць выснову, што патрыярх беларускага руху ў Латвіі кіраваўся не толькі кан'юнктурнымі прычынамі, але і шчырымі ідэйнымі памкненнямі. Пазітыўнаму стаўленню дзеяча да Савецкай Беларусі спрыяў факт, што "чырвоная" беларусізацыя адбывалася пры чынным удзеле былых дзеячаў БНР, якіх лідар латвійскіх беларусаў асабіста ведаў, называючы "нацыяналістамі-камуністамі". З многімі лідара латвійскіх беларусаў яднала супольная дзейнасць у структурах БНР у недалёкім мінулым. Не без значэння тут быў палітычны радавод К. Езавітава. Як "сацыяліст са стажам", ён не ўяўляў сабе беларускай нацыянальнай працы без класавай барацьбы і непадзельнасці "пралетарскіх" і "нацыянальных" каштоўнасцей. Ён лічыў, што беларусы павінны бараніць не толькі нацыянальныя правы, але і сацыяльныя. Пры гэтым апошнія дзеяч лічыў прыярытэтнымі. На яго думку, беларускі селянін і рабочы будуць здольнымі ўспрымаць нацыянальную агітацыю толькі пасля вырашэння іх сацыяльна-эканамічных праблем. Адначасова ён лічыў, што толькі ў спалучэнні з вырашэннем нацыянальных пытанняў

---

[10] А. Вабішчэвіч, *"Але ж шлях да свабоды старонка праложа!"* [у:] *Сыны і пасынкі Беларусі*, рэд. С. Барыс, Менск 1996, с. 330–331.

[11] *Знешняя палітыка Беларусі. Зборнік дакументаў і матэрыялаў. Т. 2. 1923–1927*, рэд. У. Міхнюк і інш., Менск 1999, с. 185–186.

можна дасягнуць трыумфу сацыялізму. Пры гэтым К. Езавітаў не крытыкаваў заходнееўрапейскі марксізм за нячуласць да нацыянальных пытанняў. На думку беларускага дзеяча, гэта ідэалогія нарадзілася там, дзе не было "нацыянальна галодных" народаў. Тым часам на ўсходзе К. Езавітаў бачыў добрыя ўмовы для развіцця сацыялізму на нацыянальным грунце. У сувязі з гэтым БССР ён уяўляў як дзяржаву, што ўвасабляе як нацыянальныя, так і сацыяльныя каштоўнасці беларусаў[12]. Свой народ К. Езавітаў з гонарам лічыў самай пралетарскай нацыянальнай групай у краіне, якая амаль цалкам складалася з незаможных сялян і рабочых. Аўтар адмаўляў прадстаўнікам "непралетарскіх" класаў права на нацыятворчую ролю для беларусаў[13]. Адначасова ён лічыў, што толькі "пралетарская беларуская дзяржава" забяспечыць развіццё беларускае культуры і вырашыць сацыяльныя праблемы беларускага народа, таму нацыянальны рух мусіць мець толькі пралетарскае аблічча[14].

Вынікам збліжэння К. Езавітава з савецкім бокам стала тое, што ў перыяд з 1924 да 1935 гг. ён з'яўляўся інфарматарам савецкага дыпламатычнага прадстаўніцтва ў Рызе. Беларускі дзеяч атрымаў мянушку "Озолс"[15]. Невыпадкова пачатак супрацоўніцтва К. Езавітава з савецкім дыппрадстаўніцтвам прыпадае на 1925 г. У тым годзе адбылася падзея, якая канчаткова схіліла К. Езавітава да цвёрдых прасавецкіх пазіцый. Гаворка пра беларускі працэс, які паказаў супярэчнасці ў дачыненнях паміж латвійскай дзяржавай і беларускім нацыянальным актывам. Пацвярджаюць гэта савецкія крыніцы,

---

[12] Наступныя словы К. Езавітава яскрава перадаюць яго погляды: "*Мы ж на падставе агульнасці ідэі беларускага руху 'звязвалі вяровачкай' селяніна-рабочага і інтэлігента, сілуючы зрабіць так, каб гэтыя два карані, – зусім супраціўныя па сваёй істоце, – спляталіся ўмесца, нягледзячы на іх імкненні ў розныя бакі. Такі погляд на агульнасць беларускага руху – неправідловы, і ў яго неправідловасці і крыецца прычына, – чаму нацыянальная сведамасць да гэтага часу не ахапіла яшчэ ўсяе беларускае меншасці Латвіі. А толькі частку яе (...) Не селянін, і рабочы, і інтэлігент павінны ісці да беларускага руху, а беларускі рух – і да селяніна, і да рабочага, і да інтэлігента. Толькі тады, калі ідэя нацыянальнага адраджэння пранікне і ў сялянскую хату, і ў майстэрню рабочага, і ў кабінет інтэлігента – толькі тады яна будзе ідэяй агульнай*". *На парозе*, "Праца. Аднаднёўка сялянска-работніцкая" 1928 ад 29 чэрвеня, с. 2.

[13] На гэты конт К. Езавітаў пісаў: "*Краёвая буржуазія Беларусі і розныя падпанкі, дамагаючыся палітычнае волі і права на самастойнае беларускае дзяржаўнае будаўніцтва, думалі і гэтую волю, і гэтую дзяржаву выкарыстаць у сваіх мэтах, аднак беларускі пралетарыят не даўся, павёў рашучае змаганне і моцным высілкам узяў уладу ў свае рукі*". *Сацыялізм і нацыяналізм*, "Голас беларуса" 1926, № 25 ад 3 лістапада, с. 1.

[14] *Сацыялізм і нацыяналізм*, "Голас беларуса" 1926, № 25 ад 3 лістапада, с. 1; *Соцыяльнае самаўсьведамленьне беларускае нацыянальнае меншасьці ў Латвіі*, "Голас беларуса" 1928, № 59, с. 1–2.

[15] Э. Екабосонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [у:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 53–54.

аналіз якіх дазваляе сцвярджаць, што ўлады ў Менску звярнулі асаблівую ўвагу на беларускае пытанне ў Латвіі пасля працэсу. Кіраўніцтва БССР намагалася выкарыстаць гэтую падзею ў сваіх палітычных мэтах. Упаўнаважаны ЦК КП(б)Б у Латвіі Фелікс Купцэвіч лічыў, што беларускі працэс спрасціў прасавецкую агітацыю сярод латвійскіх беларусаў[16].

Савецкі бок разлічваў з дапамогай К. Езавітава стварыць з мясцовых беларускіх актывістаў прасавецкую групу і выкарыстоўваць яе дзеля вядзення антыдзяржаўнай агітацыі супраць латвійскіх улад. Найбольш яскрава тактыку савецкага боку ілюструюць словы А. Ульянава, які ў траўні 1925 г., спасылаючыся на паўпрэда ў Рызе, адзначаў, што мэта савецкай працы – стварыць "*зусім нелегальнае бюро – якое мае нашага чалавека і куды ўваходзіць Езавітаў і з часам пара асоб з тых, каго мы абяром з настаўнікаў і г.д., якія звязаны з намі, працуюць пад нашым кіраўніцтвам і па нашых дырэктывах – даюць указанні і накіроўваюць усе гэтыя легальныя арганізацыі, у якіх яны персанальна прымаюць жывы ўдзел; і гэта бюро мае на мэце абуджаць свядомасць беларускага народа ў Латвіі – весці працу і зблізіць яго з Савецкай Беларуссю, і рыхтаваць масы да моманту, калі ўсе разарваныя часткі Беларусі аб'яднаюцца пад савецкім сцягам*"[17]. Такім чынам, бальшавікі ўзялі на ўзбраенне беларускія нацыянальныя лозунгі, каб, прыкрыўшыся імі, праводзіць дэструктыўную дзейнасць супраць дэмакратычнай латвійскай дзяржавы.

Найактыўней К. Езавітаў супрацоўнічаў з савецкім бокам у 1925–1928 гг. У той час беларускі дзеяч адкрыта захапляўся рэчаіснасцю ў БССР. Дзякуючы аўтарытэту сярод суайчыннікаў, К. Езавітаву ўдалося "заразіць" сваімі поглядамі частку мясцовых актывістаў, асабліва маладых. Перакананні К. Езавітава падзялялі людзі з культурна-асветных і грамадска-палітычных структур, якімі кіраваў гэты дзеяч: з рэдакцыі газеты "Голас беларуса", Таварыства беларускіх настаўнікаў у Латвіі, Беларускага навукова-краязнаўчага таварыства ў Латвіі, Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў. Узамен за прасавецкую дзейнасць К. Езавітаў мог разлічваць на грашовую падтрымку з Менска. Як ужо адзначалася, у 1925–1927 гг. перыядычныя выданні, якія рэдагаваў К. Езавітаў ("Голас беларуса" і "Беларуская школа ў Латвіі"), спансараваліся Менскам на пастаяннай аснове[18]. У 1927 г. сакратарыят ЦК

---

[16] *Знешняя палітыка Беларусі. Зборнік дакументаў і матэрыялаў. Т. 2. 1923–1927*, рэд. У. Міхнюк і інш., Менск 1999, с. 326.

[17] Цыт. пав.: В. Бароўская, *Алесь Ульянаў: старонкі жыцця (1901–1937)*, Менск 2025, с. 62.

[18] *Знешняя палітыка Беларусі. Зборнік дакументаў і матэрыялаў. Т. 2. 1923–1927*, рэд. У. Міхнюк і інш., Менск 1999, с. 158; Д.А. Короткова, *Поиски союзника. Контакты советских дипломатов в Латвии с К.Б. Езовитовым в 1925–1926 гг.*, "Славянский мир в третьем тысячелетии" 2020, т. 15, № 1–2, с. 51.

КП(б)Б вылучыў на падтрымку латвійскіх беларусаў 12 тыс. руб., з разліку 1 тыс. руб. штомесяц, з іх 750 руб. было прызначана на прэсу і 250 руб. – на кааператыўную і культурна-асветную дзейнасць. Падтрымліваючы арыентаваных на Менск беларускіх дзеячаў, савецкі бок намагаўся выклікаць унутраны раскол сярод лідараў мясцовага беларускага руху. У тлумачальнай запісцы ўпаўнаважанага НКЗС СССР пры ўрадзе БССР Сяргея Казюры (15 ліпеня 1926 г.) чытаем: "*Скромная сумма – 250 руб. в месяц, на поддержку экономических и культурных белорусских организаций даст возможность белорусским деятелям, разделяющим платформу Минска, противодействовать псевдонациональной работе правительственных белорусов вроде Тетера, Щорса и Плыгавко. Сумма месячного расхода на эту цель намечена минимальная*"[19]. Савецкі бок імкнуўся выкарыстаць К. Езавітава для супрацьстаяння з "кансерватыўнымі" дзеячамі (Я. Шчорсам, С. Сахаравым, М. Дзямідавым) і іх арганізацыямі (газета "Таспадар", БЦПАТ, таварыствы "Прасвета" і "Беларуская хата"). Дзейнасць апошніх разглядалася як "*прадажная і не адпаведная патрэбам беларускіх працоўных*"[20].

На К. Езавітава менскія бальшавікі ўскладалі задачу весці прасавецкую агітацыю сярод латвійскіх беларусаў. Невыпадкова, што асноўная частка савецкіх субсідый прызначалася на падтрымку перыядычных выданняў. Таксама менскае партыйнае кіраўніцтва намагалася выкарыстаць К. Езавітава падчас выбараў у латвійскі парламент, а таксама ў кантактах з беларускай незалежніцкай эміграцыяй. Дадзеныя эпізоды супрацоўніцтва беларускага дзеяча з савецкімі прадстаўнікамі будуць разгледжаныя ў асобных падраздзелах.

Нягледзячы на даволі актыўную заангажаванасць К. Езавітава ў прасавецкую дзейнасць менскія камуністы ставіліся да яго з насцярогай і недаверам. Палітычная афарбоўка "групы Езавітава" ацэньвалася як "нацыянал-дэмакратычная". Савецкія дыпламаты ацэньвалі працу К. Езавітава крытычна. Разам з тым, савецкі бок не бачыў іншага кандыдата, якім можна было б хутка яго замяніць. Варта працытаваць дакладную запіску ўпаўнаважанага ўрада СССР у Польшчы Аляксандра Ульянава, які курыраваў беларускія справы на эміграцыі, Сяргею Казюру (1 сакавіка 1926 г.): "*Што тычыцца Латвіі, то, на жаль, я не бачу тых беларускіх фігур, якія бы сёння ці заўтра маглі вылучыцца там на першы план так, каб гэтым можна было адкінуць Езавітава. Я лічу, што мы павінны былі б яму, безумоўна, дапамагчы і матэрыяльна падтрымаць, а ні ў якім разе яго не адштурхоўваць. Я лічу, што мы самі яго штурхаем да сацыял-дэмакратаў. На Берлінскай*

[19] *Знешняя палітыка Беларусі. Зборнік дакументаў і матэрыялаў. Т. 2. 1923–1927*, рэд. У. Міхнюк і інш., Менск 1999, с. 214.

[20] *Знешняя палітыка Беларусі. Зборнік дакументаў і матэрыялаў. Т. 2. 1923–1927*, рэд. У. Міхнюк і інш., Менск 1999, с. 236–237.

канферэнцыі Езавітаў трымаў сябе цудоўна і значная частка ў справе правядзення рэзалюцыі канферэнцыі падае на яго долю. У такім жа духу, канешне, пры пастаянным кіраўніцтве і некаторай матэрыяльнай падтрымцы, ён змог бы разгарнуць работу ў Латвіі і толькі тады можна было б, намацваючы лепшыя элементы, паступова асадзіць Езавітава на задні план. Але я сцвярджаю, што сярод латвійскіх беларусаў няма фігур з імём, а гэта ў першы перыяд арганізацыі надзвычай важна, і зараз узяць курс на падрыхтоўку кім-небудзь адшуканым пары сяброўскіх да нас беларускіх настаўнікаў і шукаць для іх матэрыяльныя сродкі, па-мойму, рана. Для Латвіі сродкі патрэбны вельмі невялікія, але даць іх, безумоўна, трэба. І даць у першую чаргу групе Езавітава. Што датычыцца сяброўскіх да нас асоб настаўнікаў, трэба прымусіць іх увайсці актыўна ў работу тых арганізацый, якія створаны былі ўжо да цяперашняга часу Езавітавым, для таго, каб узмацніць там наш уплыў"[21]. Тым не менш, ужо 30 жніўня 1926 г. у Менску было ўзнята пытанне пра замену К. Езавітава іншай асобай, звязанай з латвійскімі беларусамі. У пратаколе пасяджэння камісіі па замежных справах пры ЦК КП(б)Б падкрэслівалася, што неабходна папярэдзіць таварышаў у Латвіі пра магчымую здраду з боку К. Езавітава[22].

Ліставанне паміж савецкімі прадстаўнікамі ў Рызе і Калегіяй НКЗС у 1926 г. даводзіць, што дачыненні К. Езавітава з савецкім бокам былі складаныя. Беларускі дзеяч не з'яўляўся паслухмяным і сляпым выканаўцам волі савецкіх дыпламатаў. Яго самастойнасць і ўласная пазіцыя выклікалі непакой савецкага боку. 26 верасня 1926 г. у Даўгаўпілсе меўся адбыцца з'езд Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў, якім кіраваў К. Езавітаў. Дыпламатычнае прадстаўніцтва імкнуліся накіраваць дзейнасць арганізацыі ў рэчышча, патрэбнае савецкаму боку. З гэтай мэтай яны зацвердзілі парадак мерапрыемства. Тым часам К. Езавітаў, узгадняючы з савецкімі таварышамі праграму з'езда, захаваў у таямніцы два пункты: а) удзел беларускай меншасці ў агульнаеўрапейскіх канферэнцыях нацыянальных меншасцей і б) стварэнне арганізацыі беларускай меншасці ў Літве, Латвіі і Польшчы. Савецкія дыпламаты, якія даведаліся пра гэта з прэсы, запатрабавалі зняць пункты з павесткі дня. Пасля пратэстаў савецкага боку К. Езавітаў неахвотна, але пагадзіўся. Савецкія дыпламаты прыпісвалі К. Езавітаву авантурызм і жаданне "грымець любым коштам", а таксама "*ярко выраженную национал-демократическую физиономию*". У кастрычніку 1926 г. беларускі дзеяч звярнуўся ў савецкае прадстаўніцтва з прапановай падтрымаць выданне рускамоўнай прасавецкай

---

[21] Цыт. за: А. Вабішчэвіч, *"Але ж шлях да свабоды старонка праложа!"* [у:] *Сыны і пасынкі Беларусі*, рэд. С. Барыс, Менск 1996, с. 332–333.

[22] *Знешняя палітыка Беларусі. Зборнік дакументаў і матэрыялаў. Т. 2. 1923–1927*, рэд. У. Міхнюк і інш., Менск 1999, с. 203, 227.

штотыднёвай газеты, якую з яго падачы пагадзіўся выдаваць дэпутат латвійскага парламента старавер Мілецій Калістратаў. На думку К. Езавітава, газета, абслугоўвала б "шырокія сялянскія масы Латгаліі і рабочых горада Дзвінска" і магла выдавацца пры рэдакцыі "Голасу беларуса". Аднак прапанова не знайшла разумення савецкага боку[23].

У снежні 1926 г. С. Казюра падрыхтаваў дзве запіскі, адна з якіх была адрасаваная А. Ульянаву. Аўтар лічыў, што атрыманую з БССР грашовую дапамогу К. Езавітаў выкарыстоўвае толькі на тое, каб забяспечыць сабе месца ў парламенце, а таксама "*сохранить свое националистическое настроение, вплоть до противопоставления себя в дальнейшем Минску*". Савецкі чыноўнік лічыў дзейнасць К. Езавітава небяспечнай, мяркуючы, што "*белорусское движение он поведет на компромисс с [латвийским] правительством, а не на борьбу с ним*"[24]. У сувязі з гэтым С. Казюра прапанаваў А. Ульянаву накіраваць у Латвію асобу, якая займалася б беларускімі справамі, а К. Езавітава замяніць больш надзейным і лаяльным чалавекам ("сумленным беларусам"). Ён прапаноўваў "забраць" К. Езавітава ў Менск, каб ён больш не дыскрэдытаваў камуністычную працу ў Латвіі. У іншым лісце (8 снежня 1926 г.) С. Казюра сцвярджаў, што К. Езавітаў з'яўляецца "перакананым нацыяналістам і сацыял-дэмакратам", а ў супрацоўніцтве з БССР кіруецца ўласнымі інтарэсамі. Таму належала яго адхіліць ад кіравання беларускай дзейнасцю ў Латвіі. Адначасова аўтар падкрэсліваў, што знайсці К. Езавітаву замену складана, таму савецкі бок пакуль не можа адмовіцца ад яго паслуг. Савецкаму боку не падабалася ідэя К. Езавітава стварыць легальную беларускую палітычную партыю, здольную змагацца за месцы ў латвійскім парламенце. Праўда, нейкі час савецкія куратары К. Езавітава дапускалі магчымасць стварэння імі ў Латвіі Грамады "з той жа платформай, як Грамада ў Заходняй Беларусі". Аднак хутка ад задумы адмовіліся. Імаверна, бальшавікі асцерагаліся, што новая арганізацыя пад кіраўніцтвам К. Езавітава можа выйсці з-пад кантролю[25]. Супрацоўніцтва савецкага боку тлумачыўся недаверам да ідэйных перакананняў беларускага дзеяча. Вышэйзгаданы С. Казюра адзначаў: "*Пока не будет твердой уверенности, что эта организация будет являться орудием компартии, а не социал-демократии, – мы не можем допустить организации такой Громады (я не говорю уже о том, что при отсутствии руководства компартии такой Громадой, а значит всевозможных ее вывихов и уклонов в сторону социал-демократии и мещанского*

---

[23] Д.А. Короткова, *Поиски союзника. Контакты советских дипломатов в Латвии с К.Б. Езовитовым в 1925–1926 гг.*, "Славянский мир в третьем тысячелетии" 2020, Том 15, № 1–2, с. 54.

[24] Д.А. Короткова, *Поиски союзника. Контакты советских дипломатов в Латвии с К.Б. Езовитовым в 1925–1926 гг.*, "Славянский мир в третьем тысячелетии" 2020, Том 15, № 1–2, с. 54.

[25] В. Бароўская, *Алесь Ульянаў: старонкі жыцця (1901–1937)*, Менск 2025, с. 116-117.

либерализма с ее стороны, мы дискредитировали бы роль и значение Рабоче-Селянской Громады в Польше как органа революционной борьбы широких беспартийных рабочих и крестьянских масс)"[26].

Савецкі дзеяч лічыў, што належыць катэгарычна патрабаваць ад К. Езавітава дэкларацыі пра адмоўнае стаўленне да Лігі Нацый як "капіталістычнай арганізацыі, што эксплуатуе нацыянальныя меншасці". Больш за тое, С. Казюра хацеў адвесці К. Езавітава ад думкі пра стварэнне цэнтра для каардынацыі беларускай дзейнасці ў Польшчы і Балтыі, паколькі згодна са стратэгіяй савецкага кіраўніцтва беларусы па-за межамі БССР маглі арыентавацца выключна на Менск, а "не на какие-либо другие комитеты и организации". Падсумоўваючы, С. Казюра адзначаў: "*У меня лично глубокое убеждение, что Езовитов нашим никогда не будет, что у него достаточно хорошо развита мимикрия и он, внешне выполняя наши требования и директивы, гнет свою особую линию. У меня нет основания согласиться с оценкой его как провокатора, уверен также, что он пока особым вниманием не пользуется и у Латпра* [латвийского правительства – ЕГ], *но глубоко убежден, что белорусскую работу в дальнейших ее стадиях (и даже настоящей) он вести не сможет и не должен. Помимо того, что этот авантюрист заражен национал-демократическими настроениями безнадежно, он еще находится под сильным влиянием с[оциал-]д[емократов], и свою работу в белорусском деле он будет вести, неизбежно окрашивая ее идеологией социал-демократии, отдавая должную дань национал-демократическим верованиям, которые заложены в нем сильно. Он скорее способен пойти на любой компромисс с Латпра, чем совершить хотя бы один решительный радикальный (я уже не говорю революционный) шаг, который мы бы потребовали от него в случае нужды*"[27].

Падобныя погляды на супрацоўніцтва з К. Езавітавым дэманстраваў і А. Ульянаў, які ў лютым 1927 г. пісаў аднапартыйцам: "*Між іншым, звяртаю вашу ўвагу на 'Толас беларуса'. Езавітаў размяшчае свае дурныя ўражанні ад беларускай акадэмічнай канферэнцыі, размазваючы іх надзвычайным чынам і апісваючы нават хто як сеў, хто як кашлянуў ці чхнуў. Між іншым, кампанія пратэсту супраць разгрому польскім урадам беларускага нацыянальнага руху ў Польшчы амаль зусім ім не развітая (...) Уся ж газета наогул ні чорта не каштуе: відаць, што Езавітаў цягнецца штосілы да латвійскіх эсдэкаў,*

---

[26] Цыт. за: Д.А. Короткова, *Поиски союзника. Контакты советских дипломатов в Латвии с К.Б. Езовитовым в 1925–1926 гг.*, "Славянский мир в третьем тысячелетии" 2020, Том 15, № 1–2, с. 55.

[27] Цыт. за: Д.А. Короткова, *Поиски союзника. Контакты советских дипломатов в Латвии с К.Б. Езовитовым в 1925–1926 гг.*, "Славянский мир в третьем тысячелетии" 2020, Том 15, № 1–2, с. 55.

якія могуць забяспечыць яму "мірнае і ціхае жыццё" і, магчыма, пойдуць нават на субсідыяванне прэсы. Я не ведаю, чаму мы так зацягнулі пытанне з пасылкай у Латвію спецыяльнага працаўніка. Яго знаходжанне там зараз больш, чым калісьці, неабходнае, бо правільнай пастаноўкай справы мы маглі там стварыць асвятленне разгрому беларусаў у Польшчы і ўзмацніць пратэсты за мяжой, акрамя ўсіх шляхоў, і праз беларускую прэсу"[28]. Далейшы ход гісторыі паказаў, што, насуперак сцвярджэнням савецкага прадстаўніка, К. Езавітаў не збіраўся далучацца да латвійскіх сацыял-дэмакратаў, але ў адносінах з прадстаўнікамі СССР намагаўся трымацца самастойнай лініі, якая, на яго думку, найбольш адпавядала інтарэсам мясцовых беларусаў. Гэта не магло падабацца бальшавікам, якія хацелі бачыць у ім бязвольнага выканаўца сваіх дырэктыў.

Такім чынам належыць пагадзіцца з Дар'яй Каратковай, якая сцвярджае, што за першыя два гады супрацоўніцтва К. Езавітаў не здабыў даверу савецкага боку. Нягледзячы на фінансавую залежнасць, беларускі дзеяч не пагаджаўся быць сляпым інструментам у руках менскіх палітыкаў. Ён не вагаўся дэманстраваць уласную пазіцыю і самастойнасць, што выклікала незадаволенасць і трывогу ў савецкіх прадстаўнікоў. Апошнія планавалі з дапамогай беларускага нацыянальнага актыву стварыць сярод беларускага насельніцтва Латгаліі сетку арганізацый, падпарадкаваных Камуністычнай партыі Латвіі. Перашкаджаў К. Езавітаў, які меў уласныя мэты і амбіцыі, што не адпавядала чаканням савецкага боку[29].

У красавіку 1927 г. дзеля ўзмацнення працы з латвійскімі беларусамі ў Рыгу быў накіраваны ўпаўнаважаны ЦК КП(б) Фелікс Купцэвіч. Сваё бачанне беларускага пытання ў Латвіі ён выклаў у запісцы ў бюро ЦК КП(б)Б аб замежнай працы (22 чэрвеня 1927 г.). Аўтар называў Рыгу месцам варожай эміграцыі, якая раней не адыгрывала ў беларускім руху істотнай ролі. Ён звяртаў увага на дзейнасць у горадзе У. Пігулеўскага, Я. Шчорса, М. Дзямідава і інш. Аўтар скардзіўся на адсутнасць сярод беларускіх дзеячаў людзей з выразнымі левымі поглядамі. Кіраваныя К. Езавітавым Таварыства беларусаў-выбаршыкаў і Таварыства беларускіх настаўнікаў у Латвіі ён разглядаў як адзіныя мясцовыя беларускія арганізацыі, у якіх варта весці працу. Праўда, аўтар адзначаў, што нават яны не пазбаўленыя хібаў і заганаў[30]. Нягледзячы на "нядобранадзейнасць" К. Езавітава, ён лічыў, аднак, немэтазгодным рашуча рваць сувязь з гэтым дзеячам у сітуацыі, калі не было кім

---

[28] Цыт. пав.: В. Бароўская, *Алесь Ульянаў: старонкі жыцця (1901–1937),* Менск 2025, с. 136.

[29] Д.А. Короткова, *Поиски союзника. Контакты советских дипломатов в Латвии с К.Б. Езовитовым в 1925–1926 гг.*, "Славянский мир в третьем тысячелетии" 2020, Том 15, № 1–2, с. 56.

[30] *Знешняя палітыка Беларусі. Зборнік дакументаў і матэрыялаў. Т. 2. 1923–1927*, рэд. У. Міхнюк і інш., Менск 1999, с. 236–237.

яго замяніць. Супрацоўніцтва з К. Езавітавым, нягледзячы на яго недахопы, дапаможа прадухіліць выкарыстанне мясцовага беларускага руху палякамі і літоўцамі, сцвярджаў Ф. Купцэвіч. Ён дакладваў у Менск, што К. Езавітава нельга "ідэалізаваць як цалкам выкрышталізаваную постаць", аднак "гаворка ідзе пра выкарыстанне яго як аднаго са сродкаў супраць махровых белагвардзейцаў"[31]. Падыход Ф. Купцэвіча не знайшоў разумення ў Менску. 16 чэрвеня 1927 г. ён быў выкліканы ў сталіцу БССР, дзе ад яго запатрабавалі тлумачэнняў. Яго вінавацілі ў невыкананні дырэктывы партыйнага кіраўніцтва, якая загадвала неадкладна спыніць кантакты з К. Езавітавым[32]. У рэшце рэшт прадстаўнікі НКЗС і ЦК КП(б)Б пагадзіліся абраць у дачыненні да дзеяча наступную тактыку: "*Принципиально мы рвем с Езвитовым дело и связь, но, дабы не дать ему возможности совершенно уйти от нас и не вредить нам (…), мы временно его придерживаем*"[33].

Упэўнена можна адзначыць, што кантакты і супрацоўніцтва лідара латвійскіх беларусаў з савецкім дыпрадстаўніцтвам працягваліся яшчэ некалькі гадоў.

У сувязі з "ненадзейнасцю" К. Езавітава Менск вёў сярод латвійскіх беларусаў пошук адпаведных кандыдатаў з прасавецкай арыентацыяй[34]. Тым больш, што зацікаўленасць у кантактах з савецкім дыпламатычным прадстаўніцтвам у Рызе праяўляў не толькі К. Езавітаў, але і іншыя мясцовыя беларускія дзеячы. Сярод іх належыць узгадаць П. Мядзёлку-Грыб ды І. Краскоўскага. Вядома, што ўвесну 1925 г. яны некалькі разоў наведалі савецкае прадстаўніцтва ў Рызе. У пэўнай ступені, гэта быў вымушаны крок. Пасля беларускага працэсу абаім пагражала дэпартацыя, яны шукалі месца, куды маглі б выехаць на сталае месца жыхарства. Падчас аднаго з візітаў, 30 красавіка 1925 г., П. Мядзёлка-Грыб і І. Краскоўскі падпісалі дэкларацыю пра лаяльнасць да савецкай улады, што было ўмовай выезду ў БССР. Асаблівую схільнасць да супрацоўніцтва дэманстравала П. Мядзёлка-Грыб, якая падчас адной з размоў з савецкімі дыпламатамі атрымала заданне заставацца ў Латвіі як мага даўжэй, каб праводзіць працу сярод беларусаў. У выпадку няўдачы ёй паабяцалі, што хутка атрымае савецкую візу. Тым часам І. Краскоўскі паводзіў сябе больш стрымана. Яшчэ ў сакавіку 1922 г. ён скардзіўся Раману Ромару, што беларусы паводзяць сябе неразважліва, уваходзячы ў адносіны з бальшавікамі. Ён крытыкаваў

---

[31] *Знешняя палітыка Беларусі. Зборнік дакументаў і матэрыялаў. Т. 2. 1923–1927*, рэд. У. Міхнюк і інш., Менск 1999, с. 238.

[32] *Знешняя палітыка Беларусі. Зборнік дакументаў і матэрыялаў. Т. 2. 1923–1927*, рэд. У. Міхнюк і інш., Менск 1999, с. 239.

[33] *Знешняя палітыка Беларусі. Зборнік дакументаў і матэрыялаў. Т. 2. 1923–1927*, рэд. У. Міхнюк і інш., Менск 1999, с. 239.

[34] *Знешняя палітыка Беларусі. Зборнік дакументаў і матэрыялаў. Т. 2. 1923–1927*, рэд. У. Міхнюк і інш., Менск 1999, с. 203.

савецкую палітыку і дыпламатыю за "няшчырасць", "азіятызм" і "ўсходняе каварства", дзякуючы якім Масква была здольная пасварыць беларусаў з іх саюзнікамі. Аднак пасля беларускага працэсу і размоў з П. Мядзёлкай-Грыб ён пагадзіўся падпісаць дэкларацыю пра лаяльнасць да СССР. Савецкі бок намагаўся выкарыстаць у сваіх мэтах няпэўнае становішча І. Краскоўкага, якому пагражала дэпартацыя з Латвіі. Яскрава сведчаць пра гэта лісты А. Ульянава да Адама Славінскага (красавік 1925 г.), у якіх чытаем: "*Мы яго ўладкавалі на працу ў Транзітны Кааператыўны банк і падкормліваем. А гэта яго звязвае з намі моцна (...) Фігура ён тут заўважная – Прага прапаноўвала яму кафедру ва ўніверсітэце. Арыентацыя яго – цалкам на Савецкую Беларусь як на збіральніцу беларускага народа і вызваліцельніцу з-пад ярма прыгнечаных беларусаў. Для нас важна было б, па-мойму, каб яго сустрэлі больш ці менш цёпла, бо гэта дало б падставу ўказаць у далейшым нам усюды, што мы ўсіх 'чэсных беларускіх дзеячаў прымаем з вялікай ахвотай*"[35]. Праўдападобна, кантакты з савецкім дыппрадстаўніцтвам сталі прычынай таго, што ўжо 8 траўня 1925 г. абое атрымалі адміністрацыйны загад пакінуць тэрыторыю Латвіі на працягу 12 дзён[36]. 29 чэрвеня 1925 г. паўнамоцны прадстаўнік СССР у Латвіі выдаў І. Краскоўскаму пасведчанне, з якога вынікала, што беларускі дзеяч накіроўваўся ў Менск[37].

У полі зацікаўлення савецкага боку апынуўся таксама У. Пігулеўскі. Праўда, у Менску пра яго склалася не найлепшае меркаванне. Вышэйзгаданы С. Казюра наступным чынам характарызаваў дзеяча: "*О Пигулевском мало что могу сказать. Это тип альфонса, с.демократ, влез к Езовитову, чтобы обрабатывать последнего. Это просто жулик, способный на провокацию и предательство. Его пребывание в БССР закончилось тем, что соседи его в Москву не пустили, куда он по каким-то делам хотел проскочить фуксом*"[38]. Нягледзячы на гэта, кантакты паміж У. Пігулеўскім і савецкім бокам неаспрэчныя. У 1924 г. ён наведаў савецкае дыпламатычнае прадстаўніцтва ў Латвіі дзеля забеспячэння беларускіх школ падручнікамі. Аднак, на думку прадстаўнікоў латвійскіх улад, падчас гэтай сустрэчы абмяркоўваліся іншыя справы. У прыватнасці, беларускі дзеяч, нібыта, атрымаў прапанову заняць

---

[35] Цыт. пав.: В. Бароўская, *Алесь Ульянаў: старонкі жыцця (1901–1937),* Менск 2025, с. 60–61.

[36] T. Błaszczak, I. Matiash, D. Michaluk, *Iwan Kraskowski (1880–1955). W służbie Białorusi i Ukrainie*, Białystok 2019, s. 181–182.

[37] Д. Крэнт, *Матэрыялы Цэнтра даследаванняў старадрукаваных кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі як крыніца па гісторыі беларускага нацыянальна-культурнага жыцця ў Латвіі ў 1920–1930-ыя гг.*, "Латыши и белорусы: вместе сквозь века" 2023, № 12, с. 119.

[38] Д.А. Короткова, *Поиски союзника. Контакты советских дипломатов в Латвии с К.Б. Езовитовым в 1925–1926 гг.*, "Славянский мир в третьем тысячелетии" 2020, Том 15, № 1–2, с. 57.

нейкую пасаду ў Маскве[39]. У сярэдзіне 1920-х гг. ён атрымаў пасаду кіраўніка аддзела ў Рыжскім транзітным банку (РТБ), якім кіраваў яго стары сябра. Банк выконваў ролю пасрэдніцкай установы, праз якую савецкія грашовыя струмені скіроўваліся прасавецкім дзеячам у Польшчы і Балтыі. Можна меркаваць, што беларускі дзеяч прынамсі часткова быў у курсе выкарыстання беларускага актыву савецкім бокам. 9 сакавіка 1925 г. У. Пігулеўскі звярнуўся да А. Луцкевіча з прапановай усталяваць сувязі паміж РТБ і Беларускім кааператыўным банкам у Вільні[40]. Ён жа раіў (15 лістапада 1925 г.) беларускім віленскім дзеячам непасрэдна кантактаваць з кіраўніцтвам Дзяржбанка СССР, Усерасійскага кааператыўнага банка і Гандлёва-прамысловага банка ў Маскве з мэтай ажыццяўлення грашовых трансакцый[41]. З моманту прызначэння У. Пігулеўскага на пасаду кіраўніка Беларускага школьнага аддзела ён пакінуў пасаду ў РТБ. Невядома, аднак, ці спыніліся яго кантакты з савецкім бокам. Ён па-ранейшаму трымаў сувязь з РТБ і ў лісце (9 лютага 1927 г.) чальцу Беларускага кааператыўнага банка прапанаваў дапамогу ў банкаўскіх справах. Адначасова беларускі дзеяч прасіў дасылаць яму весткі з Заходняй Беларусі дзеля выкарыстання іх у латвійскай прэсе[42]. Разам з тым, няма непасрэдных сведчанняў супрацоўніцтва У. Пігулеўскага з савецкім бокам у перыяд, калі ён займаў найбольш адказныя пасады ў латвійскай дзяржаўнай і палітычнай сістэме.

Нягледзячы на тое, што многія беларускія дзеячы ў Латвіі перахварэлі на "чырвоную ліхаманку", ніхто з іх не меў такіх працяглых і насычаных кантактаў з саветамі, як К. Езавітаў. Яго сувязь з Менскам была настолькі відавочнай, што іншыя дзеячы беларускага руху ў Латвійскай Рэспубліцы абвінавачвалі яго ў "залішняй левізне". Савецкі фактар паглыбіў унутраныя падзелы ў беларускім лагеры. Тыя, хто хацеў захоўваць лаяльнасць да латвійскай дзяржавы, дыстанцыяваліся ад К. Езавітава. У вострай апазіцыі да яго апынуліся М. Дзямідаў, У. Пігулеўскі, Л. Клагіш, Я. Тэтар і Я. Шчорс. Асабліва складаныя адносіны, якія з часам ператварыліся ў асабістую антыпатыю, склаліся паміж К. Езавітавым і першымі двума[43]. З пазіцыі сён-

---

[39] К. Казачёнок, *"Белорусский процесс" в Латвии: обвинение, оправдание, наказание,* "Латыши и белорусы: вместе сквозь века. Сборник научных статей", ред. М.Г. Королёв, Минск 2012, с. 36.

[40] LCVA, f. 375, ap. 1, b. 12, l. 1–2.

[41] LCVA, f. 375, ap. 1, b. 12, l. 7–8.

[42] Сваё прызначэнне на пасаду кіраўніка БША У. Пігулеўскі тлумачыў наступным чынам: "*Маё новае становішча я разглядаю больш важным у нашай нацыянальнай справе ў Латвіі, і колькі хоціць сілушак буду працаваць цяпер над беларускаю культураю і прасветаю, але зразумела, што і ў гэтай маёй працы кааперацыя, сельская гаспадарка і эканоміка зоймуць важнае мейсца*". LCVA, f. 375, ap. 1, b. 12, l. 19.

[43] У лістах да дзеячаў БССР К. Езавітаў наракаў на стаўленне да яго з боку У. Пігулеўскага і М. Дзямідава, абвінавачваючы іх у паклёпніцтве і хлусні. Пра М. Дзямідава ён пісаў: "*На сцэну*

няшняга дня можна сцвердзіць, што апаненты К. Езавітава аказаліся больш абачлівымі ў дачыненні да савецкай улады. Разыходжанні паміж лідарамі латвійскіх беларусаў даюць адказ на пытанне, чаму візія БССР у езавітаўскім "Голасе беларуса" адрознівалася ад асвятлення савецкай рэчаіснасці ў выданнях яго апанентаў. Апошнім быў уласцівы больш узважаны і цвярозы погляд на савецкі лад[44].

Ва ўнутраных спрэчках беларускія дзеячы актыўна выкарыстоўвалі "савецкую карту". Напрыклад, 21–23 снежня 1929 г. на пасяджэнні беларускага настаўніцтва Рыгі адбылася вострая палеміка паміж У. Пігулеўскім і К. Езавітавым, падчас якой першы абвінаваціў другога ў тым, што ён "*вядзе справу Камінтэрну ў Латвіі*", а таксама "*ў сваёй працы радзіцца з Паўпрэдствам і ў працы сваёй кіруецца інструкцыямі Расейскага паўпрэдства*". Свой выступ кіраўнік Беларускага школьнага аддзела скончыў сцверджаннем, што "*Езавітаў кіруецца думкамі Камінтэрну*" і сваёй прасавецкай працай спрычыніўся да расколу між БША і часткай настаўніцтва[45]. Прасавецкі ўхіл К. Езавітава не падабаўся таксама некаторым беларускім дзеячам маладога пакалення[46].

Савецкі бок намагаўся пашыраць уплыў на мясцовую беларускую інтэлігенцыю выкарыстоўваючы культурна-асветныя каналы. У верасні 1926 г.

выступае новы 'апазіцыянер' Мікола Дзямідаў, які незадаволены К. Езавітавым тым, што той моцна трымае яго ў т-ве 'Беларуская хата' і не дазваляе М. Дзямідаву пускацца ў рызыкоўныя грашовыя аперацыі, якія пагражалі бы поўным правалам працы гэтага т-ва. М. Дзямідаў ужо вядомы беларускаму грамадству, як беспрынцыпны дэмагог, які дужа непрыгожа выявіў сябе ў часе беларускага працэсу, калі ён рабіў спробы ў часе следства 'пасадзіць' абвінавачваемых каб, адсунуўшы 'канкурэнтаў', потым кіраваць беларускаю працаю ў Латвіі 'на новых началах'. Не дзіва, што М. Дзямідаў выступіў цяперака з рознымі закідамі супроць Езавітава, каб перашкодзіць Езавітаву прайсці ў Сойм". LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., Ліст К. Езавітава да З. Жылуновіча, без даты.

[44] *Сялянская эміграцыя з Сав. Беларусі*, "Наша доля" 1930, № 3, с. 1; *Вывозяць беларусоў на поўнач*, "Наша доля" 1930, № 3, с. 1; *Паварот ці перадышка*, "Наша доля" 1930, № 4, с. 2; *Беларусізацыя і шавінізм*, "Наша доля" 1930, № 4, с. 3.

[45] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 111, л. 1–5.

[46] Вось як пазіцыю К. Езавітава каментаваў А. Сальцэвіч: "*Калі гр. Краскоўскі быў, дык і гр. Езавітаў ішоў па праўдзівым шляху, а як выслалі Краскоўскага дык гр. Езавітаў адразу звярнуў у бездарожжа. А за сабой і нас усіх пацягнуў. І што ў рэшце рэшт?... Цяпер сядзіць у Рызе і шле цыркуляры ў правінцыю, загады, каб падпісвалі на 'Хатку', і крычыць аб аб'яднанні аб працы, а правінцыя адказвала: 'Вы на Латгальшчыну крыж паставілі, на Дзьвіншчыну магільны узгорак паставілі, а крыж, дык мы самі паставім', сапраўды, пахаваны аддзел (толькі крыж не пастаўлены), Люцынская гімназія, школы пачатковыя і ... мы зара' ля 'разбітага карыта'. Не можна справу асабістую змешваць з агульнай. Адна асоба хацела заручыцца 'теплым местечком', а грамадства павінна цярпець. Цяпер на нас латышы дужа непрыхільна глядзяць, а гэта затрымлівае крывічам іх работу*". LCVA, f. 368, ap. 1, b. 36, l. 7.

у Менску было створана Беларускае таварыства культурнай сувязі з заграніцай. Згодна са статутам, арганізацыя мела на мэце знаёміць беларускую дыяспару са становішчам і культурнымі дасягненнямі БССР. Дзейнасць прадугледжвала культурны абмен, у тым ліку кніжнымі выданнямі; ладжанне экскурсій і культурных мерапрыемстваў на Бацькаўшчыне і за мяжой; супрацоўніцтва з замежнымі навуковымі і культурнымі цэнтрамі. З дазволу кіраўніцтва БССР К. Езавітаў, У. Пігулеўскі, а таксама латышы Я. Райніс і дацэнт Латвійскага ўніверсітэта Эрнест Блесэ (*Ernest Blesse*) наведалі Менск і ўзялі ўдзел у працы акадэмічнай канферэнцыі па рэформе беларускага правапісу і азбукі, якую 14–21 лістапада 1926 г. арганізаваў Інстытут беларускай культуры[47]. У сувязі з гэтым упаўнаважаны НКЗС СССР пры ўрадзе БССР хадайнічаў перад Барысаўскай мытняй аб тым, каб беларускія ўдзельнікі з Літвы і Латвіі (К. Езавітаў, В. Ластоўскі, У. Галавінскі) былі вызвалены ад мытнага надгляду[48]. Савецкія ўлады разлічвалі, што паездка "ў сталіцу беларускага адраджэння" паўплывае на ўмацаванне прасавецкай арыентацыі замежнага беларускага актыву. Пасля вяртання з Менска К. Езавітаў склікаў сход сяброў навукова-краязнаўчага гуртка (10 снежня 1926 г.), падчас якога расказаў аб працы канферэнцыі і падкрэсліў, што культурнае жыццё ў БССР зрабіла на яго моцнае ўражанне[49]. Падчас Дзён беларускай культуры ён прачытаў лекцыі для жыхароў Лудзы і Пакуліны пра стан беларускай нацыянальна-культурнай і школьнай справы ў БССР. У савецкім друку К. Езавітаў пісаў, што слухачы з энтузіязмам віталі культурнае развіццё ў Савецкай Беларусі, але й дзівіліся, чаму да БССР яшчэ не далучаная Смаленшчына, у тым ліку Себежчына, Невельшчына, што мяжуюць з Латвіяй, і іншыя беларускія абшары[50]. Акрамя таго, на старонках сваёй прэсы беларускі дзеяч прысвяціў канферэнцыі вялікі артыкул[51].

У лістападзе 1927 г. К. Езавітаў атрымаў ад Я. Коласа запрашэнне зноў наведаць БССР. Гэтым разам яму прапанавалі ўзяць удзел у святкаванні 20-годдзя літаратурнай дзейнасці Цішкі Гартнага, якое планавалася 15 снежня 1928 г. у Менску[52]. Заахвочаны паездкай у БССР і цёплым стаўленнем з боку савецкіх культурных дзеячаў, К. Езавітаў марыў пра ўзаемныя візіты латвійскіх і савецкіх беларусаў. Ён не ведаў, што яшчэ 1 лютага 1926 г. Камісія

---

[47] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 13 lp., Ліст упаўнаважаннага НКЗС СССР пры урадзе БССР, 28 лістапада 1928 г.

[48] LVVA, f. 3235, apr. 6, l. 196, lpp. 13.

[49] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., Праца Беларускага навукова-краязнаўчага гуртка ў Рызе (пры Т-ве беларусаў – выбаршчыкаў, 19 жніўня 1928 г.; LVVA, 3235 f., 2 apr., 4635 l., 115 lp.

[50] LVVA, 3235 f., 2 apr., 4635 l., 116 lp.

[51] К. Езавітаў, *Першая Беларуская Акадэмічная Канфэрэнцыя. Падарожжа–Уражаньні–Вынікі)*, "Голас беларуса" 1926, № 27 ад 8 снежня, с. 1–2.

[52] LVVA, f. 3235, apr. 6, l. 196, 244 lpp.

па замежных справах пры ЦК КП(б)Б выступіла катэгарычна супраць прыезду беларускіх настаўнікаў з Латвіі ў БССР[53]. У 1927 г. К. Езавітаў прасіў А. Чарвякова паспрыяць, каб Латвію наведалі Янка Купала, Якуб Колас, Міхась Чарот, Змітрок Бядуля і Зміцер Жылуновіч. 27 кастрычніка 1927 г. К. Езавітаў ад імя кіраўніцтва Даўгаўпілскага аддзела ТБНЛ звярнуўся да кіраўніка БША з прапановай зладзіць падчас калядных вакацый экскурсію настаўнікаў пачатковых і сярэдніх школ у БССР "дзеля азнаямлення са становішчам беларускае школы і асветы". Аднак У. Пігулеўскі адмовіўся падтрымаць ініцыятыву матывуючы тым, што дазвол на выезд за мяжу залежыць ад МУС[54]. Але К. Езавітаў не спыніў спроб арганізацыі паездак латвійскіх беларусаў у БССР. Вядома, што ён прасіў З. Жылуновіча дапамагчы падрыхтаваць экскурсію беларускага латгальскага настаўніцтва ў Менск, Віцебск, Гомель, Магілёў і Горкі, а таксама даць экскурсантам магчымасць наведаць тэатральныя пастаноўкі[55]. На Каляды 1928 г. лідар латвійскіх беларусаў планаваў зладзіць экскурсію вучняў беларускіх школ у БССР і звяртаўся да А. Чарвякова па дапамогу ў атрыманні савецкіх віз[56].

Адначасова К. Езавітаў рабіў спробы запрасіць у Латвію дзеячоў беларускай культуры з савецкага боку. Пазней ён сцвярджаў, што ў 1928 г. лекцыі для настаўнікаў і вучняў беларускіх школ у Латвіі прачыталі літаратары

---

[53] *Знешняя палітыка Беларусі. Зборнік дакументаў і матэрыялаў. Т. 2. 1923–1927*, рэд. У. Міхнюк і інш., Менск 1999, с. 203.

[54] У лісце К. Езавітава чытаем: "*Грамадзяніну Кіраўніку Беларускага Аддзела. Дзвінскі Аддзел Таварыства Беларускіх Вучыцялёў просіць нас аб тым, каб мы звярнуліся да Вас і Міністэрства Асветы наогул з просьбаю аб дазволе беларускім вучыцялям пачатковых і сярэдніх школ наладзіць наступнымі Колядамі экскурсію ў Радавую Беларусь дзеля азнаямлення са становішчам беларускае школы і асветы. Паведамляючы Вас аб гэтым, просім належных захадаў Вашых*". LVVA, 2125 f., 5 ap., 80 l., 9 lp.

[55] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., "Чарговая кампанія супроць К. Езавітава". Паведамленні К. Езавітава для прэсы БССР.

[56] У гэтым лісце чытаем: "*Нашы тутэйшыя вучыцялі, пад уплывам Акадэмічнае Канфэрэнцыі, а таксама зацікаўленыя весткамі аб Радавай Беларусі, якія яны атрымлівалі ад 'Тол. беларуса' (у Латвіі гэта адзіная крыніца вестак аб жыццю ў Савецкай Беларусі, бо радавых газет прыватным асобам атрымліваць няможна, а ніводная з тутэйшых газет нічога аб Беларусі не піша), – надумалася зрабіць у Савецкую Беларусь экскурсію. Экскурсія намячаецца на Коляды, бо тады вучыцялі маюць два вольныя тыдні калядных канікулаў, ды апрача таго могуць пазнаёмцца са школамі і тэатрамі. Пажадана, каб таварыства Культурнае Сувязі з Замежамі памагло нам атрымаць візы (...) Мелі мы тутака весткі аб тым, што да нас прыедзе Цішка Гартны, Янка Купала, Якуб Колас, Бядуля, Чарот, аднак Купала паехаў праз Варшаву, а аб рэшце ніякіх вестак не маемо. Для нашае меншасці гэткі прыезд быў бы вельмі пажаданы, асабліва калі б ён адбыўся ўвосені гэтага года перад паездкаю нашых вучыцялёў у Меншчыну, або вясной пасля прыезду нашых і ў адказ на гэткі прыезд* ". LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 183 lp.

Цішка Гартны, Міхась Зарэцкі і Міхась Чарот[57]. Гэтыя звесткі не знаходзяць, аднак, пацвярджэння ў дакументальных крыніцах. У кастрычніку 1929 г. К. Езавітаў спрабаваў арганізаваць прыезд у Рыгу прэзідэнта Беларускай акадэміі навук Усевалада Ігнатоўскага і рэктара БДУ Уладзіміра Пічэты з лекцыямі па гісторыі беларускага руху. Лідар латвійскіх беларусаў разлічваў, што яны таксама завітаюць у Латгалію і прачытаюць лекцыі ў Даўгаўпілсе і Лудзы[58]. Аднак гэтым задумам не было наканавана здзейсніцца. Чарговы раз выявілася розніца паміж інтарэсамі К. Езавітава і бальшавіцкіх хладаў БССР. Апошнія не лічылі патрэбным спрыяць дзеянням, якія падтрымліваюць нацыянальны патэнцыял беларускай меншасці ў Латвіі, але не гарантуюць выразных палітычных эфектаў.

Адным са сродкаў савецкага ўплыву на латвійскіх беларусаў была выдавецкая прадукцыя. У красавіку 1927 г. упаўнаважаны ЦК КП(б)Б адзначаў, што ў беларускіх школах Латвіі адчуваецца нястача навучальнай літаратуры, таму пад выглядам дапамогі неабходна забяспечыць іх савецкімі падручнікамі (перадусім вясковыя бібліятэкі), каб такім чынам ідэалагічна ўплываць на сялянскія масы. Аўтар наступным чынам абгрунтоўваў патрэбу пашырэння менскай літаратуры: "*Кніга са штампам Менска будзе дзейнічаць за нас у сэнсе ўтрымання ўвагі на Менск як сталіцу і культурны цэнтр усяго беларускага народа*"[59]. Ёсць шматлікія факты перадачы з Менску літаратуры беларускім асветным установам у Латвіі. У жніўні 1927 г. Генеральнае консульства СССР у Рызе перадало Беларускаму школьнаму аддзелу шэраг выданняў, у тым ліку кнігі "Чырвоная краіна" і "Белорусская советская социалистическая республика" [60]. У 1928 г. Інбелкульт праз Беларускае таварыства культурнай сувязі з загранічай перадаў Даўгаўпілскай беларускай гімназіі партыю літаратуры[61].

Да пашырэння савецкіх падручнікаў у беларускіх школах у Латвіі спрычыніўся К. Езавітаў, які прасіў кіраўніцтва Інбелкульта высылаць яму свае выданні ў чатырох асобніках, каб ён мог перадаць іх у Даўгаўпілс і Лудзу[62]. Дзеяч лічыў, што ў беларускіх школах наспела патрэба замены "старых" віленскіх падручнікаў новымі, якія выдае Беларускае дзяржаўнае выдавецтва. Віленскія выданні, якія выкарыстоўваліся ў школах з 1922 г., на думку К. Езавітава, па змесце ўжо не адпавядалі патрэбам беларускай школы ў Латвіі. Савецкія

---

[57] *Беларускае жыцьцё ў Лацьвіі*, "Раніца" 1944, 2 ліпеня, с. 3.

[58] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 170, 183, 204–208 lpp., К. Езавітаў "Больш увагі да жыцьця беларусаў па-за межамі БССР", 24 чэрвеня 1929 г.; НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 17, л. 9.

[59] *Знешняя палітыка Беларусі. Зборнік дакументаў і матэрыялаў. Т. 2. 1923–1927*, рэд. У. Міхнюк і інш., Менск 1999, с. 238.

[60] LVVA, 2125 f., 5 ap., 75 l., lpp. 147, 164.

[61] *Беларускае жыцьцё у Латвіі*, "Голас беларуса" 1928, № 1 ад 10 ліпеня, с. 4.

[62] LVVA, 3235 f., 2 apr., 4635 l., 121 lp.

кніжкі ён разлічваў атрымаць па лініі Беларускага Чырвонага Крыжа (БЧК). У 1927 г. К. Езавітаў ад імя ТБНЛ выпісаў некаторыя выданні з Менску, але латвійскія беларусы не змаглі за іх заплаціць, таму яны трапілі на склад. У сувязі з гэтым ён прасіў БЧК дапамагчы пераканаць Беларускае дзяржаўнае выдавецтва бясплатна ахвяраваць літаратуру беларускім школам[63]. У выніку БЧК даслаў кнігі і падручнікі, якія ТБНЛ пашырыла па школах[64]. У 1927 г. К. Езавітаў замовіў з Менска працы У. Пічэты (100 асобнікаў), С. Некрашэвіча (500), падручнікі і дапаможнікі па арыфметыцы (125), а таксама па 7 асобнікаў усіх літаратурных твораў, якія выйшлі ў Дзяржвыдавецтве БССР за апошнія пяць гадоў[65]. Таксама ён прасіў даць Беларускаму выдавецтву ў Латвіі выключнае камісійнае прадстаўніцтва на краіны Балтыі. Беларускі дзеяч пераконваў, што супрацоўніцтва дзяржвыдавецтва БССР з яго выдавецтвам прынясе сацыяльна-ідэалагічную карысць, ад якой будзе залежаць далейшае развіццё беларускай справы ў Латвіі. Адначасова ён перасцерагаў менскіх калег ад кантактаў з сацыял-дэмакратамі (У. Пігулеўскім і інш.), якія "*ніякага выдання для беларусаў не рабілі і не робяць*". Апрача таго, К. Езавітаў прасіў даць яму дазвол на перавыданне і рэдагаванне менскіх падручнікаў такім чынам, каб яны былі дапушчаныя да выкарыстання ў беларускіх школах Латвіі[66]. У жніўні 1929 г. К. Езавітаў прасіў Беларускае дзяржаўнае выдавецтва даслаць яму працы У. Леніна на беларускай мове[67]. У адным з лістоў А. Цвікевічу К. Езавітаў пісаў, што ў выпадку адмовы падтрымаць літаратурай беларускія школы ён здымае з сябе ўсю маральную адказнасць за справы беларускай меншасці ў Латвіі[68].

Латавійскія ўлады разумелі пагрозу, якую нёс імпарт савецкай літаратуры, таму забаранілі яе распаўсюд у школьных мурах. 18 снежня 1930 г. Рада БША прыняла пастанову аб забароне ўвозу ў Латвію і пашырэння на яе тэрыторыі шэрагу выданняў з БССР. Спіс ахопліваў 31 выданне[69]. 10 лютага 1931 г.

---

[63] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., Ліст К. Езавітава да Беларускага Чырвонага Крыжа, 8 жніўня 1928 г.

[64] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., Ліст Праўлення БНТЛ да Беларускага Чырвонага Крыжа, 15 лютага 1929 г.

[65] У верасні 1927 г. К. Езавітаў атрымаў з Беларускага дзяржаўнага выдавецтва кнігі У. Пічэты, С. Некрашэвіча і іншых аўтараў. LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 215 lp.

[66] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 215 lp., Ліст К. Езавітава да Дзяржвыдавецтва БССР, 17 верасня 1927 г.

[67] Э. Екабсонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [у:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 56.

[68] LVVA, 3235 f., 2 apr., 4635 l., 122, 129 lpp.

[69] У прыватнасці, у спісе забароненых кніг апынуліся: *Геаграфія Беларусі* Аркадзя Смовіча, *Цішка Гартны ў літэратурнай крытыцы* (Менск 1928), *Янка Купала ў літэратурнай крытыцы* (Менск 1928), "Чырвоная Беларусь" (№ 7 ад 1930 г.), "Полымя", "Асвета" (орган Народнага камісарыяту асветы БССР), "Беларускі Піонэр", "Чырвоны Педфакавец", "Бюлетэнь Беларускага тава-

Рады БША зацвердзіла чарговы спіс забароненай літаратуры, які ахопліваў 45 пазіцый[70]. У дакуменце, аднак, адзначалася, што некаторыя выданні з БССР могуць дапускацца да ўжытку "*пры ўмове выкрэслення фарбай тых месц і сказаў, якія не адпавядаюць варункам дзяржаўнага ладу Латвіі*"[71]. Нягледзячы на забароны, савецкая літаратура ўсё ж магла трапіць у муры беларускіх школ Латвіі: у другой палове 1920-х гг. на Рыжскіх дзяржаўных беларускіх настаўніцкіх курсах заняткі па гісторыі Беларусі (лектар С. Сіцько) адбываліся паводле падручніка Усевалада Ігнатоўскага[72]. 24 студзеня 1931 г. прадметам абмеркавання Рады Беларускага школьнага аддзела былі паводзіны дырэктара С. Сахарава, які без дазволу ўлад атрымаў падручнікі з БССР. Дырэктар тлумачыў, што зрабіў гэта з думкай пра нацыянальнае развіццё школы, але не жадаў уводзіць у яе муры палітыкі. Большасць сяброў Рады крытыкавалі ўчынак С. Сахарава і лічылі яго безадказным. На думку прысутных, кіраўнік не захоўваў належнай асцярожнасці, падстаўляючы гімназію пад абвінавачанні ў камунізме і даючы нядобразычліўцам аргумент, што ў школе адбываецца камуністычная агітацыя[73].

Асобнай старонкай супрацоўніцтва латвійскіх беларусаў з БССР было

рыства Чырвонага Крыжа", "Чырвоная краіна: дадатак да газеты "Савецкая Беларусь"), *Камсамольскія вячоркі: зборнік песень, прыпевак, гульняў, галаваломак, шарад, фокусаў, вясёлых задачак, камсамольскага гумару, гумарыстычных апавяданняў, беларускі народных казак, анекдотаў і інш.* (Менск 1927), Ленін *Збор твораў*, т. 3, (Менск 1929), В. Бэрлін *Як працаваць савету ленінскага кутка*, "Малады араты. Часопіс сялянскай моладзі", Ал. Салагуб *Лукішкі (Заходняя Беларусь): зборнік вершаў* (Менск 1929), *Беларуская Савецкая Соцыялістычная Рэспубліка* (Менск 1927), Б. А. Грунтфэст, *Што павінна ведаць работніца і сялянка аб падатках* (Менск 1927), М. Наўлянскі *Задачы коопэрацыі* (Менск 1926), Б. Д. Архангольскі *Укрупненне БССР* (Менск 1927), М.М. Хвасцюк *Ваенізацыя насельніцтва і палітасветная праца: метады пашырэння вайсковых ведаў палітасветнымі ўстановамі ў вёсцы* (Менск 1928), А. Ісбах *Са стрэльбай і кнігай (чырвонаармейскія будні)* (Менск 1928), *Працы першага Усебеларускага краязнаўчага зьезду, 7–11 лютага 1926* (Менск 1926). LVVA, 6845 f., 2 apr., 19 l., 147–148 lpp.; LVVA, 2125 f., 5 ap., 87 l., 38 lp.

[70] Сярод іх былі творы Якуба Коласа (*На прасторах жыцця* (Менск 1926)), Янкі Купалы (*Безназоўнае* (Менск 1925)) Цішкі Гартнага (*Выбраныя апавяданні* (Менск 1926) і інш.), Змітрака Бядулі (*Салавей* і інш.), а таксама кнігі – Я. Гурнік *Пятля на шыі польскага гарняка сцягваецца* (Менск 1932), *У фашысцкай Польшчы* (Менск 1931), *Супраць контррэвалюцыйнага беларускага нацыянал-дэмакратызму* (Вільня 1931), Я.А. Якаўлеў *Калгасны рух і ўздым сельскай гаспадаркі: даклад на XVI з'ездзе УсеКП(б)* (Менск 1930), *Беларуская сялянска-работніцкая грамада* (Менск 1928), Я.А. Якаўлеў *Заходняя Беларусь* (Менск 1931), *За соцыялістычную коопэрацыю: зборнік* (Менск 1931), *Выкананне пяцігадовага плану прамысловасці БССР*, М. Канаплін *"Дэмакратыя" на абарону дыктатуры буржуазіі (адносіны сацыял-фашызму за дзяржавы)* (Менск 1930), Дж. Хорабін, *Нарыс гісторыка-эканамічнай географіі сьвету* (Менск 1928), А.М. Платун *За культурную рэвалюцыю* (Менск 1931). LVVA, 6845 f., 2 apr., 19 l., 113 lp.

[71] LVVA, 2067 f., 1 apr., 364 l., 793 lp.

[72] LVVA, 2067 f., 1 ap., 407 l., 73 lp.

[73] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 38 lp.

высыланне на ўсход мясцовай моладзі. У 1920-я гг. выхаванцы беларускіх гімназій мелі абмежаваныя магчымасці атрымаць вышэйшую адукацыю ў Латвіі, і разглядаліся магчымасці выправы іх у замежныя ВНУ. Адным з кірункаў была БССР. Кастусь Езавітаў асабіста рупіўся, каб выпускнікі беларускіх школ трапілі ў вышэйшыя навучальныя ўстановы Беларускай ССР. Некаторым ён пісаў рэкамендацыі, хадайнічаў перад кіраўніцтвам Інбелкульта пра атрыманне савецкіх віз[74]. Улетку 1927 г. з дапамогай К. Езавітава вучыцца ў БССР выехалі выхаванцы Даўгаўпілскай беларускай гімназіі Валянціна Казлоўская, Янка Доўгі і Алесь Вайноўскі. Яны былі залічаныя студэнтамі адпаведна ў Менскі медычны інстытут, на педадагічны і юрыдычна-гаспадарчы факультэты БДУ[75]. Трапіць у беларускія савецкія ВНУ хацелі іншыя выпускнікі Даўгаўпілскай гімназіі. 25 кастрычніка 1926 г. Віктар Капылоў і Павел Пырсікаў звярнуліся да К. Езавітава з просьбай дапамагчы ім выехаць у БССР, каб працягнуць адукацыю, бо сельскагаспадарчы факультэт Інстытута практычных ведаў, дзе яны раней вучыліся, зачыніўся[76]. 8 лістапада 1926 г. К. Езавітаў прасіў рэктара Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі прызначыць стыпендыю і залічыць студэнтам выпускніка Даўгаўпілскай гімназіі Альфонса Антаневіча[77]. Адначасова К. Езавітаў прасіў кіраўніцтва Інбелкульта не марудзіць з запрашэннем на навучанне, бо налета юнака маглі забраць у войска[78]. Дзеяч разумеў, што выезд моладзі за мяжу аслабляе беларускі рух у Латвіі, але лічыў гэта непазбежным у выпадку юнакоў і дзяўчат, якія жадалі атрымаць вышэйшую адукацыю[79].

Ідэя выправы маладых латвійскіх беларусаў вучыцца ў БССР выклікала

---

[74] Напрыклад, у 1926 г. К. Езавітаў рэкамендаваў рэктару Беларускай акадэміі сельскай і лясной гаспадаркі выпускніка Даўгаўпілскай беларускай гімназіі Альфонса Антаневіча. LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 17 lp.

[75] *Крывіцкія руны. Вып. III: Беларускі культурны мацярык у Латвіі*, уклад., прадм., камент.: М. Казлоўскі, С. Панізьнік, Менск 2019, с. 26.

[76] У лісце чытаем: "*Маем надзею, што Вы не адкажаце ў нашай просьбе. Падрабязна не будзем апісваць, хто мы такія, так як Вам добра вядома, што мы скончылі Дзвінскую Беларускую Гімназію і лічам сябе беларусамі*". LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 19 lp.

[77] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 17 lp.; LVVA, 3235 f., 2 apr., 4635 l., 122, 148 lpp.

[78] LVVA, 3235 f., 2 apr., 4635 l., 122 lp.

[79] На старонках газеты "Голас беларуса" К. Езавітаў пісаў: "*Для нашае нацыянальнае меншасці ў Латвіі ад'езд нашых матурыстаў на вучэнне ў Менск з'яўляецца вялікаю стратаю, бо ў Латвіі свядомай беларускай інтэлігенцыі мала, і студэнцтва беларускае шмат дапамагло б старэйшаму грамадству ў працы, як у Рызе, гэтак у правінцыі; апрача таго факт гэты сумны яшчэ і тым, што не можам разлічваць на тое, што ад'ехаўшыя вучыцца ў Менск змогуць потым працаваць тутака сярод нас у Латвіі. Аднак, мы ўсё-ж ткі цешымося з таго, што незаможная наша моладзь, вышаўшая з глухіх беларускіх вёсак і працоўных гушчаў нашае меншасці, атрымае, нарэшце магчымасць здабыць сабе вышэйшую асвету, да якой яна гэтак імкнецца*". К. Езавітаў, *Стыпэндзіі для беларускае моладзі*, "Голас беларуса" 1926, № 23 ад 20 кастрычніка, с. 3.

дыскусію 6 чэрвеня 1928 г. на пасяджэнні Рады БША. У выніку была прынятая пастанова, што аддзел прыкладзе намаганні, каб затрымаць моладзь у Латвіі. Адзін з удзельнікаў дыскусіі С. Сахараў выказаў думку, што неабходна, каб спыніць уцёкі маладых з краіны, змяніць тып гімназіі на такі, што даў бы яе выхаванцам магчымасць працягнуць адукацыю ў латвійскіх ВНУ. А кіраўнік настаўніцкіх курсаў М. Дзямідаў адзначыў, што "*Езавітаў вядзе паасобныя гутаркі з курсантамі, як напрыклад, з курсантам К. Мяжэцкім у лесе*" даючы зразумець, што К. Езавітаў раіць курсантам выязджаць у Менск. Гэта абвінавачванне выклікала востры пратэст К. Езавітава, які катэгарычна запярэчыў, што схіляе маладых беларусаў да выезду ў БССР[80].

Тым не менш, вядома, што менавіта К. Езавітаў быў галоўным рухавіком выправы беларускай моладзі на навучанне ў Савецкую Беларусь. Сваю ідэю беларускі дзеяч намагаўся ажыццявіць па лініі Інбелкульта. 20 жніўня 1928 г. ён звярнуўся ў прэзідыум установы з просьбай паспрыяць вылучэнню беларускай моладзі з Латвіі 5–10 месцаў у "родных" вышэйшых школах – ВНУ БССР. Ён адзначаў, што выпускнікам беларускіх сярэдніх школ цяжка паступіць у Латвійскі ўніверсітэт па прычыне недастатковага ведання латышскай мовы. Ён прыводзіў прыклад латвійскіх палякаў, якія, дзякуючы дапамозе польскай дзяржавы, маюць магчымасць вучыцца ва Універсітэце Стэфана Баторыя ў Вільні[81]. У кастрычніку 1928 г. у Менску пагадзіліся прыняць 16 студэнтаў: у БДУ (4 месцы – на юрыдычна-гаспадарчым, 3 – на медычным і 3 – на педагагічным факультэце), Беларускую акадэмію сельскай і лясной гаспадаркі (3 месцы) і Віцебскі ветэрынарны інстытут (3 месцы)[82].

---

[80] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 69, 71 lpp.

[81] У лісце К. Езавітава на імя кіраўніцтва Інбелкульта (20 жніўня 1926 г.) чытаем: "*Працы ў нас тутака дужа многа, але працаўнікоў малавата. Здаецца, гэта – агульная хвароба нашага руху. Аднак – моладзь расце патроху. Маемо ўжо некалькі выпускнікоў нашых гімназіяй і курсаў. Вельмі нам перашкаджае тое, што мы ніяк не можам адалець латышскай мовы настолькі, каб наша моладзь магла вытрымаць экзамен у Латвійскі Універсітэт: у мінулым годзе ўсе зрэзаліся, экзаменаў гэтага года чакаемо са страхам. Ехаць у Прагу ўжо не можна. Дзе-хто з моладзі рвецца ў Менскі Універсітэт, але ж няведама як туды знайсці дарогу. Вельмі быў бы я ўдзячны, каб паважаны Прэзідыум Інбелкульта заняўся гэтаю справаю і паведаміў мяне, ці немагчыма зарэзерваваць на першы раз хаця ж 5–10 вакансіяў і стыпендыяў для беларускае моладзі з Латвіі пры Менскім Універсітэце, Віцебскім Ветэрынарным Інстытуце і Горацкай Акадэміі па 2–3 вакансіі ў кожнай з гэтых школ*". LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 23–24 lpp.

[82] 14 кастрычніка 1928 г. намеснік старшыні Інбелкульта і навуковы сакратар гэтай установы пісалі К. Езавітаву: "*Паважаны Канстанцін Барысавіч! У адказ на Ваш ліст 20-VIII-г.г. Прэзідыум Інстытута Беларускае Культуры мае гонар паведаміць, што ім для беларускай моладзі, якая скончыла сяроднюю асвету ў Латвіі, здабыта 16 месц у вышэйшых школах БССР, як-та: у Беларускім Дзяржаўным Універсітэце 10 месцаў (факультэт права і гаспадаркі – 4, медыцынскі факультэт – 3 і педагагічны факультэт – 3), у Беларускай Сельска-Гаспадарчай Акадэміі – 3 і Ветэрынарным Інстытуце – 3 месцы*". LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 16 lp.

Захады К. Езавітава выклікалі асуджэнне з боку кіраўніцтва Беларускага пазыкова-ашчаднага таварыства і таварыстваў "Беларуская хата" і "Рунь". Арганізацыі публічна адхрысціліся ад якіх-колечы кантактаў з Менскам[83].

Колькасць маладых латвійскіх беларусаў, якія скарысталіся магчымасцю навучання ў Савецкай Беларусі, была нязначнай. Галоўным чынам гэты былі тыя, каго асабіста пераканаў К. Езавітаў яшчэ да згоды Інбелкульта. У 1930 г. К. Езавітаў тлумачыў у лісце міністру ўнутраных спраў Латвіі, што ў БССР на навучанне паехалі толькі чатыры асобы: тры юнакі і адна дзяўчына[84]. Некаторыя пасля расчараваліся ў сваім рашэнні. У лісце сяброўцы адзін з тых юнакоў Гіпаліт Паўлоўскі пісаў: "*Калі б ты ведала, у якім становішчы я знаходжуся. Табе, канешне, ужо вядома, што я вярнуўся з Расіі, якую я зараз ненавіджу, а асабліва свалату Езавітава*"[85].

Культурна-асветныя кантакты латвійскіх беларусаў з Савецкай Беларуссю ў значнай ступені адбываліся дзякуючы прыватным знаёмствам К. Езавітава. Сведчыць аб гэтым яго актыўнае ліставанне з Аляксандрам Чарвяковым, Змітром Жылуновічам, Сцяпанам Некрашэвічам, Міхалам Кахановічам і інш. Колішнія паплечнікі К. Езавітава па нацыянальна-вызвольнай барацьбе ў 1920-я гг. займалі ўплывовыя дзяржаўныя пасады: А. Чарвякоў быў 1-м старшынём Прэзідыума ЦВК БССР, З. Жылуновіч – старшынём Беларускага таварыства культурнай сувязі з замежжам, С. Некрашэвіч – старшынём і супрацоўнікам Інстытута беларускай культуры, а М. Кахановіч – супрацоўнікам рэспубліканскага перыёдыка "Савецкая Беларусь", А. Цвікевіч – навуковым сакратаром Інбелкульта і намеснікам старшыні Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа. З большасцю з іх К. Езавітава аб'ядноўвала БНРаўскае мінулае, а ўсіх яднала жаданне працаваць на карысць беларускай справы. Кантакты паміж старымі адраджэнцамі мелі не толькі грамадскі, але і прыватны характар[86].

Кастусь Езавітаў лічыў, што дзяржаўныя і культурныя дзеячы БССР не надаюць належнай увагі беларусам замежжа і ім патрэбам. У адным з лістоў З. Жылуновічу ён сцвярджаў: "*Беларускае грамадства БССР, занятае бягучымі пытаннямі дзяржаўна-культурнага будаўніцтва ў БССР, нямаль зусім не звяртае ўвагі на культурнае жыццё і патрэбы беларускіх мас па-за межамі (...) У Менску існуе Т-ва культурнае сувязі, але апрача невялічкае і мала саліднае кніжыцы 'Белорусская культура' мы ні ў чым іншым не адчулі на сабе працы*

---

[83] К. Езавітаў, *Стыпэндзіі для беларускае моладзі ў Латвіі,* "Голас беларуса" 1926, № 23 ад 20 кастрычніка, 3; *Адгукі з поваду прызначэньня стыпэндзіяў у вышэйшых школах Беларусі для беларускай моладзі з Латвіі*, "Голас беларуса" 1926, № 24 ад 27 кастрычніка, с. 3.

[84] LVVA, 3235 f., 2 apr., 4635 l., 78 lp.

[85] LVVA, 3235 f., 2 apr., 4635 l., 122, 148 lpp.

[86] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 170 lp.

гэтага таварыства. Больш увагі да жыцця беларусаў па-за межамі БССР!"[87]. Аўтар дакараў Менск у тым, што ён не аказвае істотнай дапамогі дыяспары і лічыў мэтазгодным яе актывізаваць[88]. На думку К. Езавітава, належала стварыць на базе Беларускага таварыства культурнай сувязі з замежжам новую арганізацыю, якая адказвала б за кантакты з дыяспарай і выдавала ілюстраваны часопіс для беларускага замежжа[89].

---

[87] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l, Ліст К. Езавітава З. Жылуновічу, без даты.

[88] У артыкуле "Больш увагі да жыцьця беларусаў па-за межамі БССР" (24 чэрвеня 1929 г.) ён пісаў: "*Наспела ўжо патрэба, само жыццё вымагае, каб у Менску стварылася Т-ва, або ўстанова, якія ўзяліся бы не толькі за пасіўную рэгістрацыю беларускае кнігі (...) але наладзілі-б актыўнае збіранне вестак аб усіх праявах і старанах беларускага жыцця: літаратуры, мастацтва, грамадскім жыцці, эканамічным – кождая з'ява ў БССР, у Заходняй Беларусі, у Сібіру, у Латвіі, у Амерыцы, у Літве – павінна быць аднатована, асветлена і ўключана. Гэта адзін бок працы. Але гэтага мала. Апрача актыўнае рэгістрацыі фактаў беларускага жыцця, павінна яшчэ быць наладжана і дапамога беларускім калоніям, іншым этнаграфічна-беларускім тэрыторыям і беларускім меншасцям у іншых дзяржавах. Дапамога ў першую чаргу культурная: беларускія бібліятэкі, выезды беларускага тэатра, капелы, балету, арганізацыя лекцый беларускае прафесуры, выстаўкі беларускага мастацтва, этнаграфічных збораў. Арганізацыя ўсяго гэтага не пад сілу беларускім меншасцям і неарганізаваным беларускім масам па-за межамі БССР. Праводзячы гэтую працу для беларусаў па-за межамі, адначасна таварыства шмат зрабіла бы і для азнаямлення з беларускім культурным жыццём суседзяў Беларусі*". LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., К. Езавітаў "Больш увагі да жыцьця беларусаў па-за межамі БССР", 24 чэрвеня 1929 г.

[89] Ён з жалем канстатаваў: "*Беларусы са ўсяго свету глядзяць на Менск і даўно ўжо чакаюць ад яго большае энергіі і ініцыятывы ў справе кіравання беларускім духовым жыццём, адно ўжо чакаюць ад сваей метрополіі большае зацікаўленасці нашым лёсам. За 10 год існавання БССР беларускае грамадства Менску і ўсяе Радавае Беларусі ўжо павінна б было набыць дзе-якой моцы, павінна б было вырасці да свядомасці таго, што на ім ляжыць адказнасць не толькі за тую працу, якую яно прапрацоўвае па абавязках сваіх у БССР, але ходам гістарычных падзей на яго ўзложана адказнасць і за лёс тых беларусаў, што апынуліся ў вонках БССР. З таго моманту, як усё беларускае сумленнае і адказнае грамадзянства вызнала Менск сваім духовым павадыром, з таго моманту як пэўныя беларускія групы пайшлі ў Менск, як у сваю 'Каносу', менскае беларускае грамадзянства атрымала не толькі агульнае вызнанне, але ў гэты-ж момант на яго ўскладзена была ў поўнай меры і ўся адказнасць за лёс беларусаў і беларускага адраджэнчага руху ва ўсім свеце. Ці ўсе адказныя працаўнікі адчуваюць гэту адказнасць? На жаль, не толькі не ўсе, але і зусім нямаль ніхто не адчувае сябе персанальна адказным. Беларускія меншасці і беларускія этнаграфічныя масівы па-за межамі БССР пакінуты на волю лёсу. Праца сярод іх вядзецца толькі мясцовымі сіламі і мясцовымі сродкамі. Гады тры-чатыры таму назад у беларускіх калоніях і ў Заходняй Беларусі ўспыхнулі былі надзеі на тое, што вось зара менская беларуская грамадскасць возьмецца за планавую і энергічную падтрымку сваіх братоў. Але надзеі гэтыя не апраўдаліся. Менск займаўся і займаецца, пераважна, сваімі ўласнымі справамі. Няспраўджаныя надзеі выклікаюць у замежных беларускіх масах пэўную хвалю расчаравання, а на гэтых настроях спекулююць і іх выкарыстоўваюць адведчыя ворагі беларусаў, польскія паны і расейская чорная сотня. Толькі гэтыя настроі расчаравання даюць глебу для працы розных рэнегатаў, як паўлюкеўцы ды астроўцы ў Вільні, або тэтараўцы ў Рызе, жордзіёўцы ў Дзвінску. Менскае беларускае грамадства павінна нарэшце выправіць сваю памылку і звярнуць*

Беларускі дзеяч заклікаў менскіх сяброў, каб яны паспрыялі больш інтэнсіўнаму асвятленню жыцця беларусаў Латвіі на старонках БССРаўскай прэсы[90]. Ён лічыў, што Савецкая Беларусь у стане паўплываць на палітыку латвійскіх улад, каб спыніць асімілятарскія памкненні Рыгі ў дачыненні да латгальскіх беларусаў. У лістах да менскіх сяброў ён у змрочных фарбах маляваў сітуацыю беларускай асветы ў Латгаліі[91]. У лісце (20 студзеня 1927 г.) у рэдакцыю аднаго з менскіх перыёдыкаў К. Езавітаў пісаў: "*Вельмі прашу даць загад, каб газета Ваша рабіла аб нас як мага больш перадрукаў, асабліва важна, каб перадрукоўвалася ўсё тое, дзе мы жалімся на латышызацыю. Асвятленне гэтае справы ў нашым друку супакоіць апетыты тых, хто хоча шляхам аблатышвання беларусаў павялічыць лік латышоў у Латвіі. Нам патрэбна падтрымка прэсы. Нам патрэбна і тое, каб усё беларускае грамадзянства ведала, што ёсць у Латвіі гэткія шавіністычныя элементы, якія хочуць гвалтам і хітрыкамі златышваць беларускую меншасць*"[92]. Інфармуючы Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа пра закрыццё беларускіх школ, К. Езавітаў не шкадаваў крытыкі ў адрас "латышскіх шывіністычна-рэакцыйных колаў", якія жадаюць дэнацыяналізаваць і аблатышыць латгальскіх беларусаў, а таксама даць беларускім дзецям "клерыкальна-фашыстоўскае выхаванне". У сувязі з гэтым аўтар заклікаў Менск пачаць кампанію па спыненні прымусовай латышызацыі латгальскіх беларусаў[93]. У лісце

большую ўвагу на жыццё замежных беларусаў, арганізаваўшы належны апарат сувязі і дапамогі. Гэта мерапрыемства зробіць Менск запраўдным кіраўніком беларускага руху і спыніць працу ўсялякіх варожых Менску груповак". LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., К. Езавітаў *Больш увагі да жыцьця беларусаў па-за межамі БССР*, 24 чэрвеня 1929 г.

[90] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., Ліст К. Езавітава А. Чарвякову, без даты.

[91] У адным з лістоў К. Езавітава З. Жылуновічу чытаем: "*Латышскія рэакцыянеры пабудавалі на мяжы з Сав. Беларуссю цэлы шэраг вялізных школ з інтэрнатамі, у якія набіраюць дзяцей беларусаў, іх і вучаць на латышскай мове, каб аблатышыць. Беларускія школы ў халупах, інтэрнатаў няма, народ бедны, дык у латышскія школы хоць хаця-нехаця змушаны пасылаць сваіх дзяцей. Дамагаліся мы, каб у гэтых школах выкладалася бы беларуская мовах хаця ж бы як прадмет, але і гэтага не дабіліся, бо Пігулеўскі баіцца ставіць пытанне рашуча і востра, дрыжучы за сваю пасаду. Цяперака такіх школ ужо з дзясятак, пад іх адведзены палацы былых маёнткаў і будуюцца новыя вялізарныя будынкі. Ніводнага вучыцеля-беларуса ў такіх школах няма. Некалькі беларускіх школ закрыта, а на іх месца паадчынены латышскія. Пратэставаць можа толькі Езавітаў, але мне рот зачынены, бо 'Голас' маўчыць. Латышскія шавіністы цішком праводзяць тое, што зрабілі на Заходняй Беларусі палякі*". LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., Ліст Езавітава А. Чарвякову, 8 жніўня 1928 г.

[92] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 69 lp.

[93] Кастусь Езавітаў лічыў, што ўлады БССР мусяць заступіцца за беларускія школы ў Латгаліі: "*Беларускія школы наўкруг гэтых латышскіх школ пачынаюць мізарнець. Яны безумоўна будуць з кождым годам усе больш занепадаць, а потым будуць зусім ліквідаваны, калі беларускае грамадзянства Савецкае Беларусі не зробіць нам моцнай духоўнай і матарыяльнай падтрымкі. Я прашу Чырвоны Крыж, як грамадскую і ўнепартыйную арганізацыю, прыйсці нам на дапамогу.*

рэдактару "Савецкай Беларусі" К. Езавітаў пісаў: "*у газеце 'Толас беларуса' мы шмат друкуемо зацемак аб нашым жыцці. Ёсць у нас дасягненні, а ёсць і балючыя справы. Вельмі прашу даць загад, каб газета Вашая рабіла ад нас як мага больш перадрукаў, асабліва важна, каб перадрукоўвалася ўсё тое, дзе мы жалімся на ЛАТЫШЫЗАЦЫЮ. Асвятленне гэтае справы ў нашым друку супакоіць апетыты тых, хто хоча шляхам аблатышваньня беларусаў павялічыць лік латышоў у Латвіі. Нам патрэбна падтрымка прэсы. Нам патрэбна, каб усё беларускае грамадзянства ведала, што ёсць у Латвіі гэткія шавіністычныя элементы, якія хочуць гвалтам і хітрыкамі златышваць беларускую меншасць*"[94].

Акрамя таго К. Езавітаў прасіў савецкі бок дапамагчы матэрыяльна беларускаму школьніцтву (асабліва гімназіі ў Даўгаўпілсе) і лічыў, што гэта будзе мець істотнае маральнае значэнне для беларускай меншасці, якая адчуе "за сваёй спіной падтрымку сваіх братоў"[95].

К. Езавітава заахвочвалі пісаць зацемкі пра Латвію, абяцаючы друкаваць іх у беларускіх савецкіх газетах[96]. Апошні ахвотна пагадзіўся з прапановай. Ён рэгулярна рыхтаваў матэрыялы для беларускай савецкай прэсы. Яшчэ ў 1925 г. дзеяч пачаў супрацоўніцтва з газетай "Савецкая Беларусь", а пазней – з іншымі менскімі выданнямі, куды пісаў пра становішча беларускай меншасці ў Латвіі і рабочы рух у гэтай краіне[97]. Назвы артыкулаў латвійскага беларуса сведчаць самі за сябе: *Разгром партыі незалежных сацыялістаў*, *Фашысты шукаюць саюза з бермонтаўцамі*, *Манархісты афіцыйна арганізуюцца ў Латвіі*, *Першыя рэвалюцыйныя выступленні ў Латвіі*[98]. Свае

Распачніце кампанію ў прэсе, збірайце грошы на тое, каб дапамагчы нашым школам і бедным дзецям: падручнікамі, гарачымі снеданнямі, вопраткай і абуткам. Становішча наша (...) трагічнае, самі мы, дзякуючы таму, што наша грамадзянства тутака вельмі беднае, – дапамагчы сабе не маемо магчымасці. Усе ахвяры ад вечарынаў, скарбоначных збораў, падпісных лістоў і інш. можна перасылаць нам праз Транзітны Банк на імя Старшыні Т-ва беларускіх вучцыялёў гр. Канстанціна Езавітава". LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., Ліст К. Езавітава да Беларускага Чырвонага Крыжа, 8 жніўня 1928 г.

[94] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 69 lp., Ліст К. Езавітава да рэдактара газеты "Савецкая Беларусь", 20 студзеня 1927 г.

[95] У лісце (3 лістапада 1925 г.) да сяброў у БССР К. Езавітаў пісаў: "*На ближайшие месяцы было бы хорошо изыскать хотя бы на два-три месяца. Это значит – 80.000 либо 100.000 латвийских рублей, либо 300–400 долларов американских. Пособие из-за границы будет иметь еще и громадное моральное значение в глазах белорусского меньшинства, которое почувствует за своей спиною поддержку своих братьев, а также произведет надлежащее впечатление и на зарвавшихся латышских шовинистов*". LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 167 lp.

[96] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 25 lp.

[97] Гл. напрыклад: *З жыцьця беларусаў у Латвіі (Ад уласнага карэспандэнта)*, "Савецкая Беларусь" 1928, № 171 ад 26 ліпеня, с. 2; LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 12 lp.

[98] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 9 lp.; LVVA, 3235 f., 2 apr., 4635 l., 121 lp.

зацемкі К. Езавітаў дасылаў М. Кахановічу, загадчыку аддзела замежнага друку рэдакцыі. Беларускі дзеяч друкаваўся таксама ў часопісе "Полымя" просячы рэдакцыю залічыць яго ў склад сталых супрацоўнікаў, што было зроблена[99]. 5 жніўня 1928 г. К. Езавітаў пачаў рабіць захады, каб на старонках беларускай савецкай прэсы перадрукавалі яго нарыс *Беларусы ў Латвіі*[100]. Акрамя матэрыялаў культурнага характару К. Езавітаў друкаваў артыкулы пра марксізм і ленінізм[101]. 30 жніўня 1928 г. ён звярнуў увагу рэдкалегіі "Полымя" на патрэбу публікацыі матэрыялаў пра пралетарскіх пісьменнікаў Латвіі. Ён падрыхтаваў артыкул *Трое буйнейшых пралетарскіх пісьменьнікі сучаснае Латвіі*, прысвечаны Андрэйсу Упіту, Лінардсу Лайцэну і Андрэйсу Курцыйсу-Курцынскісу[102]. Больш за тое, у 1928–1929 гг. у часопісе "Полымя" былі надрукаваны некаторыя творы гэтых пісьменнікаў у перакладзе К. Езавітава: *Жар штандару* Л. Лацэна (№ 10), *Пракурор Нат* А. Курцыйса (№ 9), а таксама артыкул пра Я. Райніса (№ 3)[103].

Можна меркаваць, што акрамя жадання асвятляць беларускае жыццё на старонках савецкіх выданняў К. Езавітавым кіравалі практычныя памкненні. За свае зацемкі ён атрымліваў ганарар у далярах праз Рыжскі транзітны банк[104]. Ганарары з'яўляліся часткай прыбытку, які дзеяч прызначаў на ўласныя і грамадскія патрэбы. Часамі ганарар выплачваўся аўтарскімі асобнікамі. Гэта тлумачыць факт, чаму К. Езавітаў рэгулярна атрымліваў з Менску камплекты "Полымя", "Маладога аратага", "Маладняка", "Беларускага піонэра" і іншых перыёдыкаў. Ён сабраў салідную падшыўку савецкіх выданняў. Пры гэтым аўтар прасіў рэдакцыі дасылаць па некалькі асобнікаў, што сведчыла пра яго планы пашыраць прадукцыю ў Латвіі (15 верасня 1928 г. ён прасіў выслаць № 7 "Полымя" у 10 асобніках). Некаторыя выданні (часопіс "Чырвоная Беларусь: мастацкі ілюстраваны двухтыднёвік") латвійская цэнзура не прапускала праз мяжу, таму рэдакцыя была вымушага высылаць некалькі разоў[105]. Савецкая літаратура дасылалася К. Езавітаву замоўленымі бандэролямі, на чым ён сам настойваў. Пры гэтым прасіў, каб выданні Інбелкульта і Беларускага дзяржаўнага выдавецтва высылаліся адразу

---

[99] LVVA, 3235 f., 2 apr., 4635 l., 115, 133 lpp.

[100] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 40 lp., Ліст К. Езавітава да М. Кахановіча, 30 верасня 1928 г.; LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 196 lpp.

[101] LVVA, 3235 f., 2 apr., 4635 l., 133 lp.

[102] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 193 lp.

[103] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 231 lp.

[104] LVVA, 3235 f., 2 apr., 4635 l., 133 lp.

[105] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 231 lp. Ліст сакратара рэдакцыі часопісу "Полымя" Янкі Марука да К. Езавітава, 21 студзеня 1929 г.; LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 239 lp. Ліст К. Езавітава да супрацоўніка рэдакцыі штомесячніка "Маладняк" Станіслава Шушкевіча, 27 чэрвеня 1929 г.; LVVA, 3235 f., 2 apr., 4635 l., 135, 138 lpp.

на некалькі адрасоў[106]. Акрамя выданняў грамадска-палітычнага характару латвійскі беларус супрацоўнічаў з рэдакцыяй дзіцячага часопіса "Заранка", які заахвочваў друкаваць матэрыялы пра латвійскіх беларусаў і іх асвету. Ён лічыў, што ў Латвіі няма дзіцячага беларускага выдання, таму пажадана, каб тутэйшая моладзь атрымлівала менскае[107]. Таксама на старонках газеты "Голас беларуса" К. Езавітаў перадрукоўваў матэрыялы з менскай прэсы[108]. Дзеяч тлумачыў гэта тым, што яго газета з'яўляецца адзінай у Латвіі крыніцай ведаў пра жыццё ў Савецкай Беларусі і яе дасягненні[109].

Кантакты з беларускай савецкай прэсай і грамадска-культурнымі ўстановамі К. Езавітаў выкарыстоўваў для пашырэння ў Савецкай Беларусі ведаў пра беларускае жыццё ў Латвіі. 11 красавіка 1928 г. ён ад імя Беларускага выдавецтва ў Латвіі выказаў гатоўнасць перадаць Беларускай дзяржаўнай бібліятэцы калекцыю беларускіх афіш, адозваў, запрашэнняў і іншых выданняў[110]. 4 ліпеня 1928 г. прапанаваў дырэкцыі гэтай бібліятэкі і Кніжнай палаты наладзіць абмен літаратурай з Латвійскай дзяржаўнай бібліятэкай, каб сфарміраваць там беларускі аддзел[111]. Дзякуючы намаганням К. Езавітава, у лістападзе 1928 г. Латвійская дзяржаўная бібліятэка атрымала з Менска 73 кніжныя пазіцыі (113 асобнікаў). Адначасова К. Езавітаў інфармаваў менскіх калег пра падрыхтоўку да беларускай кніжнай выставы ў Рызе і прасіў даслаць чарговыя беларускія выданні[112].

Супрацоўніцтва К. Езавітава з БССР непакоіла прадстаўнікоў латвійскай дзяржавы. З гэтай прычыны ад 1925 г. Міністэрства асветы не дазваляла яму займаць ключавыя пасады ў сістэме беларускай адукацыі: кіраўніка БША і школьнага інспектара. Ён знаходзіўся пад наглядам палітычнай паліцыі, а 25 ліпеня 1930 г. быў арыштаваны па абвінавачанні ў камуністычнай працы[113]. Падчас арышту ў кватэры дзеяча адбыўся ператрус, паліцыя канфіскавала частку афіцыйнага і прыватнага ліставання з дзеячамі БССР (А. Чарвяковым, З. Жылуновічам, рэдакцыяй газеты "Савецкая Беларусь" і інш.). 28 ліпеня 1930 г. міністры юстыцыі і ўнутраных спраў запатрабавалі дэпартацыі дзеяча з Латвіі як асобы, якая стварае пагрозу ўнутранай і знешняй

---

[106] Напрыклад, дзіцячы часопіс "Детский журнал" быў высланы таксама на адрас 2-й Рыжскай беларускай школы, Г. Нікіфароўскай і А. Лейчман. LVVA, 3235 f., 2 apr., 4635 l., 139 lp.

[107] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 240 lp. Ліст К. Езавітава да рэдактаркі Войцікавай, без даты.

[108] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 12 lp., Ліст К. Езавітава да рэдакцыі "Савецкая Беларусь", 14 жніўня 1928 г.; Ibidem, lpp, 9, Ліст сакратара рэдакцыі "Савецкая Беларусь" да К. Езавітава, 8 жніўня 1928 г.

[109] LVVA, 3235 f., 2 apr., 4635 l., 128 lp.

[110] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 27, л. 4.

[111] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 27, л. 5.

[112] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 27, л. 9.

[113] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 6, л. 1.

бяспецы краіны[114]. 30 ліпеня 1930 г. Палітычнае ўпраўленне МУС паінфармавала пра сваё рашэнне Беларускі школьны аддзел. Аднак у абарону К. Езавітава выступіла рыжскае беларускае настаўніцтва[115]. У падтрымку К. Езавітава выступіла Латвійская партыі незалежных сацыялістаў, прадстаўнік якой А. Курцыйс-Куршынскіс на пасяджэнні Сойма 9 чэрвеня 1931 г. закрануў пытанне арышту К. Езавітава[116]. Акрамя таго, арышт выклікаў рэакцыю некаторых беларусаў па-за межамі Латвіі[117]. У рэшце рэшт, узяўшы пад увагу тое, што К. Езавітаў з'яўляўся латвійскім грамадзянінам, улады вырашылі не выдаляць яго з краіны. 24 снежня 1930 г. ён быў вызвалены з-пад варты. Імаверна, следчыя не знайшлі пераканаўчых доказаў антыдзяржаўнай дзейнасці беларускага дзеяча[118].

Тым часам савецкая палітыка ў дачыненні да беларускага руху ў Латвіі пачала мяняцца. Расла незадаволенасць партыйнага кіраўніцтва БССР эфектам працы прасавецкіх беларускіх дзеячаў у Латвіі. У студзені 1928 г. у Менску

---

[114] LVVA, 3235 f., 2 apr., 4635 l., 15 lp.

[115] 3 жніўня 1930 г. школьная рада 2-й Рыжскай беларускай школы ўхваліла: "*Канстатаваць, што за ўвесь час працы гр. К. Езавітава ў II-й Рыскай Мястовай беларускай пачатковай школе ў якасці вучыцеля, а потым кіраўніка школы, гр. К. Езавітаў ніякае камуністычнае працы ў школе не праводзіў, а таксама не вёў ніякае камуністычнае прапаганды і не распаўсюджваў камуністычную літаратуру. На агульных сходах бацькоў школы ў сваіх прамовах ніколі не зачапляў палітычных тэм, а гаварыў толькі аб педагагічных і гаспадарчых справах*" (LVVA, 2125 f., 5 ap., 196 l., 54 lp.). Удзельнікі прынялі зварот да кіраўніка БША і кіраўніцтва ТБНЛ з заклікам зрабіць усё магчымае, каб вызваліць К. Езавітава з-пад варты. Рада прасіла таксама не звальняць яго з пасады настаўніка і кіраўніка школы. Зварот быў прыняты аднагалосна з выключэннем М. Дзямідава, які паводзіў сябе асцярожна і лічыў матывы арышту К. Езавітава небеспадстаўнымі. Акрамя таго, была абрана школьная дэлегацыя ў складзе Я. Марачкоўскага і Б. Брэдэрман да старшыні Рады міністраў (LVVA, 2125 f., 5 ap., 196 l., 54 lp.).

[116] Крытыкуючы палітыку ўраду да беларусаў, палітык сказаў: "*Езавітаў на аснове закона Керанскага прасядзеў у турме цэлыя паўгода толькі таму, што ў яго была перапіска з беларускімі асветніцкімі работнікамі [з БССР – заўв. А.Ч.] і што ён выпісваў з беларускай рэспублікі [БССР – заўв. А.Ч.] некаторыя навучальныя і бібліятэчныя кнігі, хоць, як ён казаў раней, 'нашы [латвійскія – заўв. А.Ч.] беларусы не могуць стварыць не толькі сваю школьную літаратуру, але і літаратуру агулам, і таму нашым беларускім школам неабходна – не дзеля палітычных інтарэсаў, а проста ў асветніцкіх мэтах – трымаць кантакты з асветніцкімі ўстановамі беларускай рэспублікі*'". А. Чарняўскі, *Выдавецкая дзейнасць беларускай нацыянальнай меншасці ў міжваеннай Латвіі (1918–1940 гг.)*, "Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Серыя 1. Гісторыя і археалогія. Філасофія. Паліталогія" 2023, т. 15, № 3, с. 62.

[117] У лісце талінскага беларуса Міколы Чарвякова жонцы К. Езавітава чытаем: "*Даведаўшысь з расейскай часопісі 'Сегодня' аб несшасьцьі, пастігшчым Вашага супруга Канстантына Барысовіча беларусы ў Эстыі выражаюць Вам свае сабалезнаваніе і жадаюць найскорэйшаго вызваленья для працы на пользу беларускаго народу*". HI, Collection K. Yezovitov, Ліст М. Чарвякова Г. Нікіфароўскай, 1 жніўня 1930 г.

[118] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 6, л. 1.

было вырашана пераарыентаваць "беларускую" працу з вярхоў інтэлігенцыі на масы насельніцтва. У сувязі з гэтым Менск спыніў фінансавую падтрымку дзеячаў, якія былі яе ранейшымі беніфіцыярамі. У першую чаргу гэта тычылася К. Езавітава і яго выдавецкіх праектаў, пра што была гаворка ў падраздзеле, прысвечаным беларускай прэсе ў Латвіі[119]. Ва ўмовах эканамічнага крызісу савецкі бок пачаў рабіць стаўку на непасрэдную працу з сялянскімі і рабочымі масамі без удзелу беларускага нацыянальнага актыву. Было вырашана падпарадкаваць беларускую працу кіраўніцтву Кампартыі Латвіі. У паразуменні з апошнім менскія бальшавікі планавалі адправіць сваіх людзей у Латвію дзеля арганізацыі беларускай працы па лініі НКЗС СССР[120]. Адначасова было вырашана надаць большую ўвагу працы з моладдзю. У 1930 г. МУС Латвіі інфармавала Міністэрства асветы, што камсамол узмацніў працу сярод вучнёўскай моладзі, асабліва вучняў старэйшых клас. Праявай камуністычнай актыўнасці было з'яўленне падпольных выданняў "Асноўная праграма палітпрасветы" і часопіса "Вучань камуністычнай моладзі"[121]. Пра наяўнасць пагрозы з боку дэструктыўных сіл сведчыць факт, што ў 1930 г. латвійскія ўлады даручылі кіраўнікам нацыянальных школьных аддзелаў Міністэрства асветы "рашуча змагацца з магчымасцю камуністычных уплываў сярод вучняў". У дакуменце адзначалася, што "*згодна 'Інструкцыі для камсамолу' першым заданнем з'яўляецца 'стварэнне ўзаемнай розні і незадаволенасці паміж вучнямі і настаўнікамі, бо на гэтым грунце прасцей злучаць вучняў у камсамольскія арганізацыі*'"[122].

Цяжка вызначыць, наколькі была эфектыўнай камуністычная дзейнасць сярод беларускай вучнёўскай моладзі. Вядома, што прынамсі частка яе ўспрымала камуністычную прапаганду. Латвійскія ўлады звярталі ўвагу, што ў беларускай гімназіі ў Даўгаўпілсе пануюць антыдзяржаўныя настроі. Тым часам беларускія дзеячы сцвярджалі, што камуністычныя погляды сярод вучнёўскай моладзі прысутнічаюць паўсюль, але сярод беларусаў не маюць яны большай падтрымкі, чым у іх аднагодкаў іншых нацыянальнасцей[123]. Беларускае настаўніцтва намагалася прадухіліць якую-колечы камуністычную агітацыю ў мурах беларускіх школ. Напрыклад, 26 жніўня 1930 г. педрада Даўгаўпілскай беларускай гімназіі прыняла рашэнне правесці інструктаж усіх беларускіх настаўнікаў Даўгаўпілшчыны пра пагрозу камуністычнай агітацыі. Тым не менш, гісторыя ведае некалькі выпадкаў, калі

---

[119] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 212 lp.; LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 184 lp.

[120] *Знешняя палітыка Беларусі. Зборнік дакументаў і матарыялаў. Т. 3. 1928–1941*, Менск 2001, с. 14–15.

[121] LVVA, 2067 f., 1 ap., 364 l., lp. 640.

[122] LVVA, 2125 f., 5 ap., 87 l., 20 lp.; LVVA, 2067 f., 1 ap., 364 l., 631 lp.

[123] "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 4, с. 198.

беларускія вучні далучаліся да падпольнай працы. 3 лістапада 1930 г. дырэктар С. Сахараў інфармаваў Беларускі школьны аддзел: "*Трэба адзначыць, што яна* [камуністычная дзейнасць – ЕГ] *не мела поспехаў сярод вучняў. Праўда, некаторыя адзінкі, па назіраннях маіх і класных настаўнікаў, знаходзіліся пад уплывам левага ўхілу, але актыўнай і адчыненай прапаганды ў мурох гімназіі не вялося. Толькі з боку аднаго вучня – Міколы Панькова былі папыткі праявіць актыўнасць у гэтым напрамку і, калі мерапрыемствы педагагічнага характару не далі належных вынікаў, дык Пед. Рада не застанавілася перад апошняю мераю і выключыла ў канцы студзеня 1930 г М. Панькова з гімназіі без права паступлення назад. Аб гэтым выпадку ведае Дзвінскі аддзел палітычнай абароны. Да гэтага лічу патрэбным дадаць, што М. Панькоў і па звальненні не пакідаў сваёй падпольнай працы і 28 жніўня гг. з'явіўся ён вечарам у інтэрнаце гімназіі і параскідаў пракламацыі. Вучні аб гэтым далажылі выхавацелю інтэрната У. Ю. Відаўскаму і прынеслі раскіданыя пракламацыі. На другі дзень адміністрацыя гімназіі паведаміла аб гэтым Дзвінскі аддзел палітычнай абароны, які з свайго боку ўжо прыняў меры супраць Панькова і вядзе аб ім следства*"[124].

Выпадак вучня Міколы Панькова заслугоўвае дэталёвай увагі. Маладзён не належаў да самых паспяховых вучняў гімназіі[125], але праяўляў цікавасць да беларускай нацыянальнай справы[126]. Невядомыя абставіны, у якіх вучань усталяваў сувязь з камсамольцамі. Змест беларускамоўнай улёткі, якую М. Панькоў раскідаў у інтэрнаце гімназіі 28 жніўня 1930 г., дазваляе ўявіць характар савецкай агітацыі, скіраванай на маладое пакаленне латгальскіх беларусаў: "*Вучашчаяся моладзь, злучайся! К беларускай вучачайся моладзі! Таварышы-вучні! Мы, беларуская, моладзь, маўчалі і чакалі пакуль хэўра белагвардзейцаў і папоў сама кіне сваю брудную працу, але, як відаць яна гэтага і не думае і толькі глуміцца з беларускае справы. Таму вось мы, беларуская моладзь, хоць перажываем страшэнны момант, аднак у змаганні не здадзімся ніколі! Мы не спалохаемся ніякае рэакцыі і заўсёды дадзім належны адпор. Мы,*

---

[124] LVVA, 2067 f., 1 ap., 364 l., 644 lp.

[125] Аб кепскай паспяховасці вучня сведчыць ліст дырэктара С. Сахарава яго маці Крысціне Паньковай (лістапад 1928 г.), у якім чытаем: "*Ваш сын Мікола зусім неакуратна хадзіў і ходзіць у класу, таксама ён часта кудысьці-то ўваходзіць з інтэрната. Паспехі яго надта дрэнныя*". Педрада гімназіі выставіла яму нізкія адзнакі за паводзіны, а таксама прасіла маці звярнуць увагу на паводзіны сына (LVVA, 2067 f., 1 apr., 404 l., 7 lp.). 20 лістапада 1928 г. педрада прыняла рашэнне аб выключэнні М. Панькова з гімназіі "*за нарушэнне школьнай дысцыпліны накіраванай к падрыву аўтарытэту гімназіі і яе нармальнай працы*", але з правам паступіць зноўку (LVVA, 2067 f., 1 apr., 404 l., 8 lp.).

[126] Кіраўніцтва гімназіі адзначала, што маладзён пазычыў у настаўніка С. Казекі кнігі Максіма Гарэцкага *Гісторыя беларускай літаратуры* (Вільня 1924) і Браніслава Тарашкевіча *Беларуская граматыка для школ*. LVVA, 2067 f., 1 apr., 404 l., 20 lp.

моладзь беларуская, сыны працоўных і сялян, дзець крывіцкіх ніў, з'імшалых вёсак, кідаем гэты кліч: таварышы-вучні, мы, каторыя сядзелі па турмах за вас, каторых выкінулі са школы, каторыя сёння церпім тут, вучачыся, і голад, і холад, каб забранае аддаць народу, мы, вашы браты, каторыя баронім вас, змагаючыся за вас, клічам вас на змаганне ў свае рады! Вучні! Мы дамагаемся гэтага для вас і вашага дабра! А калі мы зрачомся, калі вы не пойдзеце нам на сустрэчу – бяда будзе вам! Памятаяце 1928 год! Будзе горш! Таму, усе ў рады 'лепшай долі'! Хай кожны з вас голасна крычыць: прэч з рэакцыяй! Далоў паразытаў беларускай справы! Прэч з парабкамі цара! Жыве адзіны фронт змаганьня беларускай моладзі! Мы хочам быць людзьмі! Хай жыве 'лепшая доля'!"[127].

За сваю правіну М. Панькоў быў выключаны з гімназіі. Аднак ужо напрыканцы лістапада 1930 г. ён звярнуўся да кіраўніцтва школы з просьбай прыняць яго назад[128]. Пазней юнак не быў заўважаны ў сувязях з камуністамі ці камсамольцамі. Гэтая акалічнасць дазваляе сцвярджаць, што той выпадак удзелу ў прасавецкай працы меў эпізадычны характар. Інцыдэнт з вучнем М. Паньковым не быў адзіным, калі беларусы згадваліся ў сувязі з камуністычнай агітацыяй. У 1931 г. латвійскія ўлады падазравалі, што два гімназісты – Уладзімір Кавальчук (2-гі клас) і Ілля Падлюбны (1-ы клас) – займаліся агітацыяй на карысць Савецкай Расіі[129]. У газеце "Двинский голос" (№ 9 ад 29 студзеня 1932 г.) з'явілася зацемка аб тым, што паліцыя арыштавала Канстанціна Дубавіка, кандыдата ў радныя Даўгаўпілскай павятовай управы, які кіраваў камуністычнай ячэйкай. Аўтар публікацыі падкрэсліў, што затрыманы з'яўляецца выхаванцам беларускай гімназіі ў Даўгаўпілсе. Дырэктар С. Сахараў мусіў накіраваць у рэдакцыю ўдакладненне, паколькі К. Дубовік ніколі не быў вучнем беларускай школы[130]. 26 жніўня 1932 г. кіраўніцтва ТБНЛ у звароце да міністра асветы адзначала, што камуністы вядуць агітацыю не толькі сярод вучняў беларускай гімназіі, але таксама ў школах іншых нацыянальнасцей[131].

Разам з тым існуюць доказы, што ў мурах гімназіі дзейнічала камсамольская ячэйка. 18 кастрычніка 1929 г. пабачыла свет 4-старонкавая рукапісная газета "Новая зара. Аднаднёўка групы вучняў Дзьвінскай Беларускай Гімназіі". Лозунгам выдання былі словы: "Без змагання – няма перамогі" і "Пралетары ўсіх краін, злучайцеся". У загалоўку адзначалася, што выданне

---

[127] LVVA, 2067 f., 1 ap., 364 l., 465 lp.

[128] У сваёй заяве да дырэктара ён адзначаў: "*Я абяцаю выконваць свае абавязкі як трэба вучню, бо я шчыра каюся ў быўшых сваіх праступках і абяцаю больш ніякіх спраў не рабіць. ПС. Я не быў актыўным дзеячам у гэтай справе, а падпісаў таму, што сябры казалі, які я буду сябра, калі не падпішу*". LVVA, 2067 f., 1 apr., 404 l., 9 lp.

[129] LVVA, 1632 f., 2 apr., 499 l., 55 lp.

[130] LVVA, 2067 f., 1 ap., 365 l., 93 lp.

[131] LVVA, 1632 f., 2 apr., 499 l., 36–38 lpp.

прысвечана агульнай забастоўцы 18 кастрычніка, якую ладзілі камуністы ў Рызе, Ліепаі, Даўгаўпілсе і іншых гарадах. Аўтары кляймілі "буржуазію і эсдэкаў", якіх ставілі ў адзін шэраг з ворагамі працоўнага класу. Выданне ўтрымлівала вершы Я. Купалы і К. Крапівы. Заслугоўвае ўвагі ананімная зацемка *Тэстамэнт першай беларускай газэты*, аўтар якой абгрунтоўваў патрэбу з'яўлення новай беларускай газеты, напрамак якой "выходзе з пачуццяў кахання к свайму Беларускаму Народу, кіруецца свядомасцю і неабходнасцю яго далейшага культурнага развіцця, з пэўнай вераю ў яго будучыню"[132]. Гэтыя словы былі анонсам таго, што неўзабаве пачне выходзіць вучнёўская газета "Наш шлях". Аднак галоўныя пастулаты выдаўцоў аднадзёнкі ўтрымлівала *Дэкларацыя групы вучняў да Пэдрады Дзьвінскай Беларускай гімназіі*, якая нагадвала ўльтыматум на адрас школьнага кіраўніцтва: "*1. Зняць усе паліта-бмежаванні над вучнямі-беларусамі, 2. Выключыць з гімназіі ўсіх варожа настаўленых да народнай справы, 3. Весці сапраўды змагарны рух за беларускую народную справу, 4. Зняць плату за вучэнне з сапраўды вучняў бедных бацькоў, 5. Усе дзярждапамогі павінны быць падзелены педагогамі і прадстаўнікамі ад вучняў паміж бяд. вучнямі, 6. Даць доступ на паседжанні Педрады прадстаўнікам ад вучняў, 7. Даць свабоду арганізацыі ў сценах гімназіі*"[133]. Далей чытаем: "*Мы ведаем, што педагогі будуць нас праследаваць, але не глядзім на тое, што ім падабаецца, і што не. Мы просім і будзем прасіць тое, што трэба працоўнаму вучнёўству. Педагогі і дырэктар па-добраму нам нікога не далі і не дадуць. Нашы трэбаванні педагогі ніколі не задаволяць і таму толькі актыўным змаганнем мы даб'ёмся сабе праў і задавальнення нашых трэбаванняў. Толькі пры сялянска-работніцкай уладзе мы зможам існаваць свабодна. Толькі пры сялянска-работніцкай уладзе даб'юцца беларусы свайго самаазначэння. Супроць белагвардзейска-манархічнага фронту – хай жыве фронт сыноў рабочых і сялян! Хай жыве непадзельная Беларусь!*"[134].

25 кастрычніка 1929 г. выйшла яшчэ адна рукапісная 4-старонкавая газета "Паступовец. Аднаднёўка вучняў паступіўшых у гімназію" (рэдактар-выдавец пад псеўданімам С. Саўлас). Выдавалася яна пад лозунгам "Змагайся – пераможаш". Ва ўступным слове выдаўцы падкрэслівалі: "*У гэтым годзе мы далучаемся да старэйшых вучняў і разам з імі павядзём змаганне. Ужо ў пачатку мы бачым, што нашыя аб'яднанні моцныя і дасягненні ў змаганні вялікія. Нам падстаўляюць розныя прыманкі, але мы, на правакацыю не паддадзімся, усе папыткі белагвардзейцаў адкінем, а іх нападкі на нашыя дасягненні адаб'ём. Мы не станем здраднікамі, на падобнасць іншым з IV(X) класы, такі іх брудны канец, на канцы вучэння апошніх дзён поўзаючых на каленках перад*

[132] LVVA, 3235 f., 2 apr., 4635 l., "Новая зара", 18 X 1929 г., с. 3.
[133] LVVA, 3235 f., 2 apr., 4635 l., "Новая зара", 18 X 1929 г., с. 4.
[134] LVVA, 3235 f., 2 apr., 4635 l., "Новая зара", 18 X 1929 г., с. 4.

белагвардзейцамі і рэакцыяй. Таварышы-браты, кляйміце такіх пазорам, ганіце іх прэч ад сябе. Будзьце пэўны, што мы пераможам! Таму, што апроч 'беларускага' голаса манархістаў ёсць голас і вучняў працоўных бацькоў"[135].

У праграмным артыкуле *Вечнае, добрае* аўтарства рэдактара "Нашага шляху" пад псеўданімам Кастуся Каліны чытаем: "*Экзамены, пераіспыты, паступленне ў гімназію – сучасныя лозунгі, трэбаванні сучаснай вучнёўскай думкі. Вызваленне акупаваных частак Беларусі і злучэнне ў суцэльнае гаспадарства – вось сцяг, пад каторым ідзе свядомая частка беларускіх вучняў пад ярмом панскай Польшчы, белай Латвіі і кулацкай Літвы. Гэта – заданне бліжэйшай эпохі, падзея змучаных і жадаючых свабоды чыстых сэрцаў Беларусі. На гэтым шляху – шляху аб'яднання і сувязі беларусаў – пісанне ці друкаванне беларускага слова, якое і павінна сеяць добрае, вечнае. Бо не ў габінетах міністраў і мітынгах куецца грамадскае мненне, а ў рэдакцыях газет (хоць і такіх, як наша рэдакцыя 'Паступоўца'), у горнах жывога беларускага слова. Жывое беларускае слова павінна ўзяць на сябе заданне – прапаганду ідэі свабоды, роўнасці і братэрства ўсіх народаў. Жывое беларускае слова – павінны скінуць тую цемень, якая пануе і зараз сярод беларускіх масаў. Мы павінны вырваць з рук буржуазіі не толькі меч, але і крыж, і кнігу*"[136]. Далей даваўся кароткі агляд нацыянальна-дзяржаўных дасягненняў Савецкай Беларусі. Аўтары выказвалі спадзяванне на злучэнне беларускіх зямель "у адну непадзельную дзяржаву і асвабаджэнне з-пад ярма панскай Польшчы, белай Латвіі і кулацкай Літвы". Даваўся таксама кароткі агляд таго, што адбывалася ў Латвіі (прызначэнне новага прадстаўніка СССР Аляксея Свідэрскага – "запраўдны чалавек на запраўдным месцы") і Літве. Істотнае месца займала зацемка ў рубрыцы *Арганізацыйныя справы* пад назвай *Што павінен зрабіць кожны/ая вучань/іца беларус/ка*. У гэтым тэксце чытаем: "*1. Кожны свядомы вучань-беларус павінен клапаціцца аб вызваленчай арганізацыі працы. 2. Кожны вучань павінен клапаціцца, каб яго таварышы не прадстаўлялі 'стада баранаў'. 3. Кожны вучань павінен быць сябрам сваёй вучнёўскай арганізацыі, аб чым павінен падаць просьбу-заяву. 4. Кожны свядомы вучань павінен растлумачыць сваім таварышом у чым справа, калі яны запішуцца ў сваю арганізацыю і чаго гэтым даб'юцца. 5. Калі хто стане адмаўляць ці запугіваць вучняў, каб не згуртоўваліся, аб гэтым трэба зараз жа паведаміць кіруючых таварышоў*"[137].

Выдаўцы закраналі ўнутраныя справы гімназіі. Яны лаялі педраду гімназіі ("гаспада Сахараў і ко") за тое, што пакрыўдзіла вучня 2 класа Лябёдка, не даючы яму бясплатных абедаў як "камуністу-гультаю". У артыкуле чытаем: "*Ці вы не ведаеце, што толькі пад 'ігам' камунізму і развіваецца беларуская*

[135] LVVA, 3235 f., 2 apr., 4635 l., "Паступовец", 25 X 1929 г., с. 1.

[136] LVVA, 3235 f., 2 apr., 4635 l., "Паступовец", 25 X 1929 г., с. 1.

[137] LVVA, 3235 f., 2 apr., 4635 l., "Паступовец", 25 X 1929 г., с. 2.

літаратура! Ці вы запамяталі, што толькі дзякуючы камунізму, беларускі народ дабіўся незалежнасці і зараз з БССР атрымлівае гімназія розныя дапамогі! Таварышы-вучні! Зберым сабранне, перагутарым аб гэтых ліквідатарах і канфіскатарах, адчынім сваю, хоць бы тайную, арганізацыю"[138]. Выданне заахвочвала моладзь запісвацца ў таварыства Лепшай Долі (старшыня Кастусь Каліна), у якую можна было запісацца ў вучняў К. Каліны і М. Пушчы. Выданне інфармавала, што 6 лістапада 1929 г. адбудзецца сход вучняў, на якім будуць заслуханы наступныя справы: даклад пра сучасны момант, кастрычніцкая рэвалюцыя, даклады з месцаў і бягучыя справы. Акрамя таго, адзначалася, што днямі павінна пачаць выходзіць тыднёвая вучнёўская газета "Наш шлях", рэдакцыя якой запрашае "ўсіх вучняў і вучаніц паказаць сваю свядомасць і браць актыўны ўдзел у выданні"[139].

На мяжы 1920-х і 1930-х гг. савецкая палітыка ў дачыненні да латвійскіх беларусаў перажыла эвалюцыю. На гэта паўплывалі змены ў савецкай дзяржаве. Рост нацыянальнай свядомасці і дасягненні на нацыянальна-культурнай ніве "нярускіх" народаў выклікалі засцярогі кіраўніцтва СССР. Калі І. Сталін сканцэнтраваў у сваіх руках уладу ў краіне, адбыліся карэнныя змены ў нацыянальнай палітыцы. Першым звестуном трывожных змен у БССР было з'яўленне ў Менску ў траўні 1929 г. камісіі ЦК ВКП(б), якая занялася вывучэннем нацыянальнай палітыкі ў рэспубліцы. Маскоўская камісія востра скрытыкавала дзейнасць мясцовай інтэлігенцыі, што стала пачаткам цкавання яе з мэтай падрыхтоўкі грунту для будучых рэпрэсій. І ўжо ў 1930 г. ОГПУ раскруціла сфабрыкаваную справу г.зв. Саюза вызвалення Беларусі, вынікам якой стаў арышт 108 прадстаўнікоў беларускай навукі і культуры. Большасць з іх была асуджаная на высылку ў аддаленыя часткі Савецкага Саюза. Разам з палітычнымі зменамі ў СССР радыкальна памянялася тактыка Менска да латвійскіх беларусаў. Спынілся культурна-асветныя кантакты К. Езавітава з дзеячамі ў БССР, якія сталі "ворагамі народа". Набіраючы моц сталінізм і змаганне з "нацдэмамі" азначалі, што савецкая ўлада ўжо не гуляе ў дабрадзейку беларускага нацыянальнага руху за межамі краіны. У 1933 г. у Менску ў выдавецтве Беларускай акадэміі навук выйшла брашура былога выхаванца Даўгаўпілскай беларускай гімназіі Янкі Доўгага пад назвай *Беларускі нацыянал-фашызм у Латвіі*. Аўтар не шкадаваў крыўдных слоў на адрас беларускага руху ў Латвіі і яго кіраўнікоў. Ва ўступе чытаем: "*беларускія контррэвалюцыйныя эмігранты, арганізатары банд Балаховіча (...) пастаўлены латвійскай буржуазіяй на чале беларускага нацыяналістычнага руху*"[140].

---

[138] LVVA, 3235 f., 2 apr., 4635 l., "Паступовец", 25 X 1929 г., с. 4.

[139] LVVA, 3235 f., 2 apr., 4635 l., "Паступовец", 25 X 1929 г., с. 4.

[140] Я. Доўгі, *Беларускі нацыянал-фашызм у Латвіі*, Менск 1933, с. 5.

Галоўным аб'ектам крытыкі аўтара стаў К. Езавітаву, якога ў брашуры называлі "белагвардзейцам", "лакеем латвійскай буржуазіі", "нацыянал-фашыстам", "здраднікам рабочых і сялянскіх мас". Цікава, што, характарызуючы становішча беларускага насельніцтва ў Латвіі, аўтар выкарыстаў працы К. Езавітава. Брашура выйшла ў перыяд пагрому "нацдэмаў" у БССР, таму яе аўтар намагаўся прасачыць сувязі "беларускіх нацыянал-фашыстаў" у Латвіі з "нацдэмамі" у Савецкай Беларусі. Нядаўнія кантакты латвійскіх беларускіх дзеячаў з Менскам паслужылі аўтару ў якасці доказу іх антысавецкай дзейнасці. У прыватнасці, Я. Доўгі падаў супрацоўніцтва К. Езавітава з СССР як праяву "рэальнай палітыкі" і спробу максімальнага выкарыстання бягучай сітуацыі "ў сваіх класавых мэтах". Змест брашуры і думкі аўтара яскрава адлюстроўваюць яго словы: "*Пад беларускім берлінскім зменавехаўствам трэба разумець манеўр класавага ворага, які замест лабавой атакі спрабаваў праводзіць яе стараною (...) Асеўшы ў Латвіі Езавітаў у сваёй газеце 'Голас беларуса' змяшчае падрабязныя інфармацыі пра культурныя дасягненні БССР, якія ён успрымае ў аспекце нацдэмаўшчыны. У гэтай жа газеце змяшчаецца заклік 'Беларусу эмігранту' вяртацца да 'хаты' – гэта значыць у БССР, дзе, па думцы Езавітава, будуецца 'хата мужыцкай дзяржаўнасці' (...) Як вядома, гэты кліч не застаўся гукам у пустыні. З усіх куткоў Еўропы пачалі з фальшывым 'покаяніем' вяртацца да 'хаты' гандляры працоўнымі масамі Беларусі. Іх стаўка была біта, але яны ўсё яшчэ мелі надзею адыграцца (...) Контррэвалюцыйныя беларускія эмігранты, арганізатары белабандыцкіх банд, асеўшыя па той бок мяжы, у шчыльным кантакце з нацдэмамі БССР праводзілі сваю контррэвалюцыйную работу*"[141].

Рэакцыя латвійскіх беларусаў на трагічныя падзеі ў Савецкай Беларусі была слабая. На пачатку 1930-х гг. у Латвіі яшчэ выдавалася беларуская прэса, але на яе старонках не знайшлося месца для асвятлення падзей у БССР. Кастусь Езавітаў і іншыя прасавецкія дзеячы латвійскіх беларусаў не хацелі або не былі ў стане адрэагаваць на рэпрэсіі, якія набіралі моц на Бацькаўшчыне. Да нешматлікіх выключэнняў належаў даклад М. Дзямідава, пра пераслед беларускіх культурных дзеячаў у Беларускай ССР, прачытаны 30 сакавіка 1931 г. на пасяджэнні кіраўніцтва таварыства "Беларуская хата"[142].

У разгар сталінскіх рэпрэсій трагічны лёс спаткаў маладых латвійскіх беларусаў, якія выехалі ў Савецкую Беларусь. Яскравым прыкладам з'яўляецца выпадак Я. Доўгага, В. Казлоўскай і А. Вайноўскага, якія ў 1927 г. эмігравалі ў БССР. Усе трое былі арыштаваныя, а падчас следства чэкісты паставілі ім у віну тое, што яны, нібыта, былі завербаваныя "рэзідэнтам латвійскай выведкі" К. Езавітавым і накіраваныя ў Менск з мэтай шпіёнскай дзейнасці

[141] Я. Доўгі, *Беларускі нацыянал-фашызм у Латвіі*, Менск 1933, с. 31–33.

[142] LVVA, 2750 f., 1 apr., 6 l., 22 lp.

на карысць "буржуазнай Латвіі". Па справе В. Казлоўскай і А. Вайноўскага К. Езавітаву адводзілася роля арганізатара агентурнай сеткі латвійскай выведкі ў БССР, да якой, апрача вышэйзгаданых фігурантаў, мелі дачыненне Вацлаў Ластоўскі, Паўліна Мядзёлка-Грыб і Міхась Чарот. Падчас допыту (17 снежня 1937 г.) В. Казлоўская пад прымусам засведчыла: "*Езавітаў даў мне шэраг адрасоў асобаў, што жывуць у БССР, якія павінны былі ўладкаваць мяне ва ўніверсітэт, і далей я па заданні Езавітава павінна была збіраць для яго звесткі аб арганізацыі працы ва ўніверсітэце, аб колькасці навучэнцаў, аб настроях студэнтаў і выкладчыкаў. Збіраць і перадаваць Езавітаву звесткі пра эканамічнае й палітычнае жыццё ў Беларусі. Гэтыя шпіёнскія звесткі я, паводле прапановы Езавітава, павінна была перадаваць праз Вайноўскага й іншых асобаў, што жылі ў Менску, адрасы якіх мне даў Езавітаў. Пасля афармлення Езавітавым вярбоўкі мяне, Вайноўскага й Доўгага на прапанову Езавітава дырэктар настаўніцкіх курсаў у Рызе Пігулеўскі выдаў нам усім тром грошай на жыццё ў СССР*"[143]. Маладая дзяўчына была асуджаная да вышэйшай меры пакарання, прысуд быў выкананы. Яе лёс падзялілі Я. Доўгі і А. Вайноўскі. Першы быў арыштаваны 17 сакавіка 1938 г. у Акцюбінску, дзе працаваў выкладчыкам. Латгальскі беларус быў асуджаны на смерць паводле арт. 58-1 КК РСФСР. Другі – арыштаваны 28 сакавіка 1938 г. па падазрэнні ў "шпіёнскай дзейнасці на карысць латвійскай выведкі", а 16 чэрвеня гэтага ж году расстраляны[144].

Выпадак тройкі маладых латвійскіх беларусаў не быў адзіным, калі савецкія карныя органы выкарысталі знаёмства з К. Езавітавым як доказ удзелу ў "нацдэмаўшчыне". У архівах савецкай дзяржбяспекі захоўваюцца згадкі пра тое, што з К. Езавітаў і У. Пігулеўскі трымалі сувязь з Янкам Купалам. Функцыянеры НКВД разглядалі гэтыя кантакты як кампрамат на беларускага песняра[145]. Сталінскі тэрор не абмінуў блізкіх К. Езавітава, якія жылі ў Савецкай Беларусі. Ахвярамі рэпрэсій сталі яго брат[146] і бацька[147]. Малодшы брат, Барыс Езавітаў (1903 г.н.), які працаваў ветэрынарам у Аршанскай ветлячэбніцы, быў арыштаваны 21 траўня 1933 г.[148] 9 ліпеня 1933 г. ён быў

---

[143] М. Шапіра, *"Лясная Кветка" (Лёс Валянціны Казлоўскай)* [у:] П. Сокал, В. Казлоўская, *Выбраныя творы*, рэд. М. Казлоўскі, С. Панізнік, Менск 2016, с. 147.

[144] *Крывіцкія руны. Вып. III: Беларускі культурны мацярык у Латвіі*, уклад., прадм., камент.: М. Казлоўскі, С. Панізьнік, Менск 2019, с. 26.

[145] П. Сокал, В. Казлоўская, *Выбраныя творы*, рэд. М. Казлоўскі, С. Панізнік, Менск 2016, с. 116, 117, 146–148.

[146] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 16, л. 2.

[147] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 22, л. 21.

[148] 27 чэрвеня 1929 г. К. Езавітаў хадайнічаў перад старшынёй Галоўнавукі пры НКА БССР Сцяпанам Некрашэвічам за свайго брата Барыса – каб Некрашэвіч паспрыяў залічэнню Барыса Езавітава ў аспірантуру Віцебскага ветэрынарнага інстытута. У лісце К. Езавітаў адзначаў, што

асуджаны калегіяй ОГПУ як “член контррэвалюцыйнай шпіёнскай шкодніцкай арганізацыі” паводле арт. 58-2, 7, 10, 11 КК на 5 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Бацька, пенсіянер Барыс Ануфрыевіч Езавітаў, які жыў у Віцебску, быў арыштаваны 3 кастрычніка 1937 г., а ўжо 10 кастрычніка асуджаны “тройкай” за антысавецкую агітацыю паводле арт. 72, 74 КК БССР на 10 гадоў ППЛ. Адсутнічаюць звесткі наконт далейшага лёсу гэтых людзей.

ім кіруе не пачуццё сваяцтва, а жаданне рупіцца пра падтрымку беларусаў сярод навуковых супрацоўнікаў Віцебскага ветінстытута, а таксама дбанне пра маральную кандыцыю беларускай меншасці ў Латвіі. Чытаем: “*Мне вельмі няёмка прасіць Вас аб падтрыманні і зацвярджэнні Барыса Езавітава на аспіранта, бо нікога і ніколі яшчэ не прасіў аб сваіх крэўных, але я ведаю, што Вы зразумееце, што мной зара кіруюць не пачуццё радні, а толькі жаданне дапамагчы БССР мець навуковых супрацоўнікаў-беларусаў. Спадзяюся, што Вы не адмовіце ў зацвярджэнні Б. Езавітава аспірантам у Віцебскім вет-інстытуце, бо апрача вышэйпаказанага беларускага матыву, у гэтым моманце будзе яшчэ вялікі палітычны матыў, які прынясе тутэйшай беларускай меншасці значную карысць у змаганні з латвійскімі шавіністамі і ўсімі тымі, хто тутака гаворыць аб уціску беларусаў і радні беларускіх дзеячоў у БССР*” (LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 170 lp.). Тым часам, брату Міхасю, які працаваў у лесанарыхтоўцы на Браншчыне, К. Езавітаў пісаў (3 студзеня 1929 г.) пра брата Барыса: “*Шкадую, што Барыс не астаўся пры Ветэрынарным у якасці аспіранта. Паведамі яго, што гэта будзе зроблена і Галоўнавука БССР мне гэта абяцала, але Барыс павінен гутарыць па-беларуску і стаяць бліжэй да беларускага грамадзянства. Бо Галоўнавука прасоўвае ў аспірантуру ў першую чаргу тых, хто будзе шчыра выконваць партінструкцыі і кірунак на беларусізацыю. Гэта ён павінен нарэшце зразумець: уся маскальшчына з беларускіх навуковых колаў будзе выкінута, бо яна ідзе ў апазіцыі да беларусізацыі, а знача і да БССР і да партыйнага кірунку. Надзвычайна добра было б, каб ён сваю працу для дзяржаўнага экзамена даў у беларускай мове. Яшчэ лепш было б, каб ён пачаў супрацоўнічаць у ‘Мэдычнай думцы’, якая выходзе ў Менску. Я разлічваю, што Барыс будзе адным з сапраўдных беларускіх прафесараў Ветінстытута ў будучыні, і гэта справа зусім рэальная і залежыць усё ад самога Барыса і ад ступені ягонае беларускае свядомасці, бо тады яго падтрымаюць беларусы*” (LVVA,. 3235 f, 6 apr., 196 l., 171 lp.). У гэтым жа лісце К. Езавітаў заклікаў сваіх братоў трымацца беларускасці і далучыцца да беларусізацыі, а пачаць ад сябе: “*Наагул мая табе братэрская рада: кінь чытаць расейскія часопісі і выпішы сабе абавязкова ‘Полымя’, газету ‘Савецкая Беларусь’ ды часопісь ‘Наш край’. Бяз гэтых часопісаў нават мы тутака абыходзіцца не маем магчымасці, бо інакш былі б адарваны ад беларускага духовага жыцця, табе-ж гэта і зусім немажліва. Калі ты хочаш вярнуцца ў Беларускую ССР, якая за пяць год мо нават сама прыдзе да цябе (зусім не выключана, што Браншчына і Смаленшчына праз 5 год будуць далучаны да БССР), дык ты павінен быць у курсе беларускіх спраў (...) Міколу я раджу таксама бліжэй стануць да беларускіх таварышаў. Хай ён будзе ў першых радах тых, хто змагаецца за выкананне пастаноў партыі аб беларусізацыі. Ён хлапец разумны і расейскім шавінізмам не захоплены, і расейскага шавінізму, які яшчэ гэтак моцны ў Віцебску, не спалохаецца, дык хай змагаецца з адрыжкай царскіх часоў на Беларусі і ваюе за поўную беларусізацыю Ветэрынарнага інстытута. Гэта праца будзе карыснай і для БССР і для яго самога. Я дужа хацеў бы, каб ён увайшоў ў Віцебскае Т-ва Краязнаўства і папрацаваў тамака (...) Пісьмо гэта пасылаю табе на адрас матулі, бо твайго яшчэ ня ведаю. Перашлі прачытаць пісьмо Барысу і Міколу. Хай абодва мне напішуць свае думкі*”. LVVA, f. 3235, 6 apr., 196 l., 172 lp.

Імаверна, абодва Езавітавы загінулі ў сталінскіх катоўнях. Сын і бацька былі рэабілітаваныя падчас "хрушчоўскай адлігі" – у 1956 і 1958 г.[149]

Падсумоўваючы вынікі сувязей паміж латвійскімі беларусамі і Савецкай Беларуссю належыць заўважыць, што яны былі непазбежнымі па аб'ектыўных прычынах. Беларусы Латвіі, як кожная меншасць, імкнуліся падтрымліваць прынамсі сімвалічную і маральную сувязь з бацькаўшчынай. У змаганні за захаванне сваёй адметнасці як нацыянальнай меншасці яны мусілі арыентавацца на яе ў культурным і нацыянальным развіцці. Нягледзячы на тое, што Савецкая Беларусь была палітычнай фікцыяй, яна выконвала ролю "метраполіі" хаця б таму, што іншай не было. У міжваенны перыяд не існавала незалежнай беларускай дзяржавы, таму беларусы замежжа мусілі выпрацаваць сваё стаўленне да БССР. Многія хацелі бачыць у ёй утварэнне, якое магло выконваць ролю хоць нейкай формы беларускай дзяржаўнасці. Акрамя таго, існавалі практычныя меркаванні, якія рабілі непазбежным супрацоўніцтва прадстаўнікоў беларускай меншасці з Менскам. У Савецкай Беларусі дзейнічалі дзяржаўныя і культурна-асветныя ўстановы (Акадэмія навук, бібліятэкі, вышэйшая і сярэдняя адукацыя, прэса, выдавецтвы), з якімі беларускаму актыву належала трымаць сувязь, каб не выпасці з агульнабеларускага культурнага кантэксту. Беларускія дзеячы ў замежжы не ўлічылі, аднак, магчымасці ператварэння савецкай сістэмы з адносна ліберальнай – у таталітарную. Яны не разумелі, што бальшавіцкая ўлада ўспрымала інтэлігенцыю не як групу творчых вольных людзей, а як цалкам паслухмяных і адданых бальшавіцкай ідэі выканаўцаў загадаў зверху. Савецкі бок разглядаў кантакты з беларусамі Латвіі як магчымасць уплыву на ўнутраную палітычную сітуацыю ў латвійскай дзяржаве. З савецкага пункту гледжання Латвія з'яўлялася часткай варожага капіталістычнага свету, ёй кіравала "буржуазна-нацыяналістычная зграя", з якой СССР мусіў змагацца. Згодна з задумай Менска, латвійскія беларусы мусілі быць інструментам, які дазволіў бы савецкаму кіраўніцтву пашыраць камуністычныя погляды сярод жыхароў Латвіі. Іншай мэтай савецкага боку была нейтралізацыя ўплыву на латвійскіх беларусаў альтэрнатыўных беларускіх палітычных сіл. Даючы грошы на патрэбы беларускага жыцця, "чырвоны" Менск жадаў, каб латвійскія беларусы зрабіліся пятай калонай, штурхаў іх на антыдзяржаўныя пазіцыі. У выніку савецкая дапамога прынесла латвійскім беларусам больш шкоды, чым карысці. Наступствам гэтых кантактаў было пагаршэнне стаўлення да беларускай дзейнасці з боку латвійскіх улад, а таксама паглыбленне непаразуменняў у беларускім лагеры.

Цікавым пытаннем з'яўляецца матывацыя прадстаўнікоў беларускага нацыянальнага актыву, якія вырашылі супрацоўнічаць з савецкім бокам.

[149] http://www.stalin-list.org/node/51452 (дата доступу: 01.01.2025 г.).

Наколькі жаданне супрацоўнічаць з БССР вынікала са шчырых памкненняў, а наколькі было прадыктаванае практычнымі меркаваннямі? Аналіз даступнага матэрыялу дазваляе зрабіць выснову, што прынамсі частка дзеячаў нейкі час верыла, што Савецкая Беларусь можа быць увасабленнем беларускіх нацыянальных мараў і памкненняў. Вырашальны ўплыў на фарміраванне такога ўяўлення зрабіў сацыялістычны радавод большасці лідараў мясцовага беларускага руху, а таксама палітыка беларусізацыі, якая праводзілася ў БССР 1920-х гг. Далейшы ход гісторыі паказаў усю марнасць надзей на беларускае адраджэнне з падтрымкай савецкай улады. Аднак у 1920-я гг. мала хто з беларускіх дзеячаў быў у стане прадбачыць, чым скончыцца савецкая беларусізацыя і што ў сапраўднасці з сябе ўяўляе Савецкая Беларусь[150].

Аднак, незалежна ад матываў супрацоўніцтва, беларускія дзеячы ў Латвіі не былі бязвольнымі выканаўцамі менскіх дырэктыў. Яскравым прыкладам з'яўляецца К. Езавітаў, які глядзеў на супрацоўніцтва з Менскам праз прызму таго, што яно можа даць мясцоваму беларускаму руху. На падставе даступных крыніц можна меркаваць, што гэты чалавек кіраваўся перадусім дабром беларускай меншасці, а ўжо потым жаданнямі савецкага боку. Нярэдка гэта выклікала незадаволенасць савецкіх куратараў. Узяўшы пад увагу розніцу мэт абодвух бакоў, гэтыя кантакты былі пазбаўленыя перспектыў. Згортванне беларусізацыі ў БССР пазбавіла большасць беларускіх дзеячаў ілюзіі, у палоне якой яны знаходзіліся. Далейшыя рэпрэсіі паўплывалі на пераасэнсаванне беларускімі дзеячамі ранейшых поглядаў і прымусілі шукаць на міжнароднай арэне новыя палітычныя арыенціры. Тычылася гэта і лідараў латвійскіх беларусаў.

Кантакты з суайчыннікамі па-за межамі БССР

Акрамя кантактаў з БССР лідары латвійскіх беларусаў трымалі сувязь з родзічамі ў іншых краінах. З апошнімі латвійскіх беларусаў яднала важная акалічнасць: яны знаходзіліся ў падобнай юрыдычнай сітуацыі, лічыліся нацыянальнымі меншасцямі ў краінах свайго пражывання. У міжваенны час асноўнымі асяродкамі беларускага жыцця (акрамя Латвіі) былі: Чэхаславакія, Польшча, Літва і ЗША.

Чэхаславакія. Характэрнай рысай кантактаў латвійскіх беларусаў з суайчыннікамі ў ЧСР быў факт, што ў гэтай краіне (з 1923 г.) знаходзіўся ўрад БНР. Беручы пад увагу тое, што заснавальнікамі беларускага руху ў Латвіі

[150] В. Герасімаў, *Дзьве кнігі Кастуся Езавітава* [у:] К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі й Літве*, Нью Ёрк – Менск 2013, с. 6.

былі дзеячы БНР, дачыненні паміж імі і ўрадам на выгнанні былі непазбежныя. У вачах першых структуры БНР з'яўляліся жывым увасабленнем нацыянальных і патрыятычных каштоўнасцей, сімвалам змагання беларусаў за "права людзьмі звацца". Нягледзячы на тое, што ўрад БНР на чужыне існаваў больш "віртуальна", чым "рэальна" беларускі нацыянальны актыў Латвіі лічыў яго прыхільнікам каштоўнасцей і ідэалаў, якія ўвасабляў Акт 25 Сакавіка. Як ужо адзначалася, беларускія арганізацыі ў Латвіі культывавалі сярод сваіх сяброў веды і памяць пра БНР і яе ідэалы, а ў мурах беларускіх школ паслядоўна адзначаліся гадавіны абвяшчэння БНР[151].

Дачыненні з эміграцыйным урадам мелі не толькі сімвалічнае і маральнае значэнне. На пачатку 1920-х гг., калі беларускія арганізацыі і школы ў Латвіі толькі запачаткоўваліся, нацыянальны актыў разлічваў на матэрыяльную дапамогу структур БНР. У жніўні 1921 г. К. Езавітаў прасіў урад В. Ластоўскага ў Коўне дапамагчы наладзіць беларускае жыццё ў Латгаліі ў момант, калі яно рабіла свае першыя крокі[152]. Аднак беларускія эміграцыйныя палітыкі, якія ў той час знаходзіліся ў крызісе, не былі ў стане істотна дапамагчы латвійскім беларусам[153]. Беларускія дзеячы ў Латвіі не перасталі шукаць дапамогі ў структур БНР і пазней. У ліпені 1925 г. К. Езавітаў безвынікова прасіў П. Крачэўскага і В. Захарку паспрыяць атрыманню са Славянскага інстытута ў Празе падтрымкі на выданне газеты "Голас беларуса"[154].

---

[151] Асабліва гучна было адзначана 15-годдзе абвяшчэння БНР, якое адбылося ў 1933 г. у Рызе. LCVA, f. 368, ap. 1, b. 33, l. 36.

[152] Лідар латвійскіх беларусаў пісаў: "*Зусім зразумела, што існуючай у Латгаліі агульнай беднасцю, а не адсутнасцю пачуцця трэба тлумачыць тое, што каса 'Бацькаўшчыны' зусім пуста. Зусім зразумела, што пры патрэбе пачынаць працу, пры патрэбе прыцягваць новых членаў і рабіць паездкі, пры правядзенні, нарэшце, выбарчай кампаніі, – будуць патрэбны і ўжо патрэбны грошы. На месцы атрымаць іх немагчыма. Да гэтага часу ўсё, што зроблена, – зроблена за мой уласны кошт. Але два месяцы таму назад я ўжо страціў апошняе, што меў, спыніў аб'езд Латгаліі (не быў у Бальбінове, Разагоўскай і Корсаўкі), не папаў у Курляндыю (Улукст і Нова-Аляксандраўск)), і жыву сам, і падтрымліваю другіх і справу – асабістымі пазыкамі, як гэта было ў прошлым годзе. Зусім зразумела, што так далей цягнуцца не можа, бо праца зойдзе на нет. Я хачу, каб было зроблена вось што: а) звернута і выплачана ад Урада тое, што мне ад яго належыць за гэты год; б) знайдзена Нацыянальнай Сувяззю Крыніца да субсідыявання Бенасу ў Латвіі, каб яна магла правесці выборную кампанію ў Парламент (выбары ў Латвійскй Парламент адбудуцца ў снежні і ўсе ўжо да іх рыхтуюцца), наладзіць аддзел і дастаўку падручнікаў у школы. Далейшай дапамогі патрэбна не будзе. Справа пойдзе сама і на мясцовыя кошты*". БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 56, л. 168–169.

[153] У звароце Рады народных міністраў БНР да міністра замежных спраў Літвы ад 23 студзеня 1922 г. чытаем: "*В заключении имею честь обратить Ваше внимание, Глубокоуважаемый г. Министр, что положение Правительства БНР в настоящий момент весьма критическое. Работа начинает останавливаться, связь начинает обрываться*". Беларускі бок прасіў пазыку ў памеры 2 млн марак. АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1269.

[154] ГАРФ, ф. 5875, оп. 1, д. 11, л. 433.

Некаторыя прадстаўнікі беларускай меншасці ў Латвіі бралі ўдзел у дзейнасці эміграцыйных структур БНР. На пачатку 1920-х гг. у склад Рады БНР у Празе ў якасці "спачуваючых" увайшлі тры прадстаўнікі ад латвійскіх беларусаў: К. Езавітаў, У. Пігулеўскі ды І. Краскоўскі[155]. Дзякуючы ім, урад БНР быў у курсе культурна-асветных спраў беларускай меншасці ў Латвіі. У 1923 г. А. Цвікевіч прапанаваў латвійскім сябрам больш актыўна далучыцца да беларускай дзейнасці. У сваю чаргу І. Краскоўскі азнаёміў з гэтай прапановай кіраўніцтва таварыства "Бацькаўшчына". Асабліва актыўным у кантактах з урадам БНР з'яўляўся К. Езавітаў, які рэгулярна ліставаўся як з дзейнымі, так і колішнімі дзеячамі Беларускай Народнай Рэспублікі. Напрыклад, з пражскімі беларускімі незалежнікамі (П. Крачэўскім, В. Захаркам і М. Вяршыніным)[156].

Акрамя актыўнага ліставання з былымі паплечнікамі па працы ў структурах БНР, К. Езавітаў працягваў браць удзел у сходах і сустрэчах беларускага незалежніцкага актыву. У якасці дэлегата ад беларусаў Латгаліі і таварыства "Бацькаўшчына" ён разам з І. Дварчаніным удзельнічаў у працы Беларускай нацыянальна-палітычнай нарады, якая адбылася 26–30 верасня 1921 г. у Празе[157]. Мерапрыемства мела палітычны характар, што рабіла прысутнасць на ім латвійскага беларуса праявай палітычнага ўдзелу ў жыцці іншай дзяржавы. Нагадаем, на гэтай канферэнцыі была прынятая рэзалюцыя аб прызнанні прынцыпу непадзельнасці Беларусі згодна з Актам 25 Сакавіка, а ўсе беларускія нацыянальныя сілы заклікалі аб'яднацца ў адзіны нацыянальны лагер вакол ураду БНР, а народ – устрымацца ад неарганізаваных паўстанняў да моманту, калі праб'е гадзіна нацыянальнай рэвалюцыі. Удзельнікі канферэнцыі асудзілі Рыжскае мірнае пагадненне і прызналі правамоцнасць на беларускіх землях толькі Рады БНР, якая вяла змаганне за незалежную і непадзельную беларускую дзяржаву[158].

Беларуская палітычная эміграцыя намагалася абараняць беларускіх дзеячаў у Латвіі. Урад БНР выкарыстоўваў свой аўтарытэт, каб дапамагчы суайчыннікамі. Напрыклад, звяртаўся да дзяржаўных дзеячаў Латвійскай Рэспублікі з просьбай працаўладкаваць у мясцовых беларускіх школах педагогаў-беларусаў, якія не з'яўляліся латвійскімі грамадзянамі[159]. Актыў

---

[155] А. Чернякевич, *БНР: Триумф побежденных*, Минск 2018, с. 265.

[156] В. Кіпель, *Беларусы ў ЗША*, Менск 2017, с. 131.

[157] Падчас прамовы К. Езавітаў падкрэсліў прыхільнае стаўленне латвійскай дзяржавы да беларускай меншасці. Ён адзначыў, што частка беларускага народа, якая жыве ў Латгаліі, дзякуючы талерантнасці ўлад Латвіі карыстаецца ўсімі правамі нацыянальнай меншасці, а адраджэнская праца не пераследуецца, што дазваляе пашырацца беларускай свядомасці. БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 169, л. 5.

[158] *Беларускі працэс у Латвіі*, "Голас беларуса" 1925, № 2 ад 20 чэрвеня, с. 3.

[159] 30 сакавіка 1922 г. прэм'ер В. Ластоўскі прасіў Я. Райніса паспрыяць прыезду на працу ў Латвію І. Краскоўскага: "*Культурна-нацыянальная аўтаномія для беларускай меншасці у Латгаліі,*

БНР і дзеячы, з ім звязаныя, рэагавалі на сітуацыю беларускай меншасці ў Латвіі. У прыватнасці, сход студэнтаў-беларусаў у Празе ў 1925 г. прыняў рэзалюцыю, у якой узгадваліся беларускія землі, што адышлі да Латвіі і дзе "латвійскія каланісты" забіраюць зямлю ў беларускага працоўнага народа. Адначасова адзначалася, што належыць дапамагаць Даўгаўпілскай беларускай гімназіі, паколькі гэта дасць пачуццё ўпэўненасці латвійскім беларусам і "зробіць уражанне на зарваўшыхся латышскіх шавіністаў"[160].

Аднак найбольш яскрава цікавасць беларускай палітычнай эміграцыі да латвійскіх беларусаў выявілася падчас судовага працэсу над беларускімі дзеячамі ў Латгаліі ў 1924–1925 гг. Справа атрымала розгалас у асяродках беларускай палітычнай эміграцыі – у Празе, Коўне, Берліне і г.д. 18 лістапада 1924 г. старшыня Рады БНР П. Крачэўскі ў звароце да прэзідэнта Латвіі Я. Чакстэ назваў працэс над беларускімі дзеячамі "сумным непаразуменнем выкліканым ворагамі беларускага адраджэння". Кіраўнік БНР запэўніваў латвійскі бок, што дзейнасць латвійскіх беларусаў не нясе пагрозы дзяржаве, у якой яны жывуць[161]. 10 студзеня 1925 г. у лісце міністру замежных спраў Латвіі ён сцвярджаў, што ніводзін беларускі палітык не жадае адарваць Латгалію ад латвійскай дзяржавы, каб далучыць да БССР[162].

Стаўленне латвійскіх улад да сувязей беларускіх дзеячаў з эміграцыйнымі структурамі БНР было неадназначным. З аднаго боку, урад БНР у выгнанні не разглядаўся як пагроза для латвійскай дзяржаўнасці, а з іншага – улады ў Рызе баяліся, каб ідэя "адзінай і непадзельнай" Беларусі не абудзіла ў латвійскіх беларусаў нацыяналістычных і рэваншысцкіх настрояў, якія стваралі б пагрозу для інтэгральнай цэласнасці Латвіі. Сведчыць пра гэта факт, што на следстве падчас беларускага працэсу ў якасці доказаў віны лідараў латышскіх беларусаў прыводзіліся сведчанні пра іх кантакты з прадстаўнікамі

Вашымі захадамі і стараннямі, ужо закончана. Ралля да засеву прыгатавана: патрэбны цяпер добра свядомыя справы сяўцы, якіх яшчэ на жаль паміж тамтэйшымі мясцовымі сіламі вельмі недахват. Мы па магчымасці дзяліліся людзьмі і некаторыя ўжо працуюць у Дзвінску. Цяпер прасілі паехаць у Латгалію грамадзяніна І. І. Краскоўскага, нашага старога і вядомага грамадзянскага працаўніка, выкінутага палякамі з яго роднай Вільні. Ён згадзіўся. Але без Вашай ласкавай апекі яму трудна будзе даць раду з такой маладой яшчэ беларускай справай, як у Латгаліі. І я ўважліва прашу Вас, Дастойны Пане Райніс, аказаць яму і далейшаму будаванню беларускай справы ў Латгаліі помач сваёй дасведчанай радай, апекай і пратэкцыяй" (АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1308). У тым самым часе кіраўнік МЗС БНР А. Цвікевіч накіраваў ліст міністру замежных спраў Латвіі Зігфрыду Мееровіцсу ў справе прыезду ў Латвію І. Краскоўскага. Беларускі палітык выказаў падзяку латышскім уладам за падтрымку беларускай меншасці ў Латвіі (АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1291).

[160] LVVA, 3235 f., 2 apr., 4635 l., 111 lp.

[161] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1548.

[162] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l.,. 4 lp.; LVVA, 3235 f., 2 apr., 4635 l., 126 lp.

беларускай незалежніцкай эміграцыі ў іншых краінах. У прыватнасці, кіраўніцтва таварыства "Бацькаўшчына" вінавацілі ў тым, што яно дэлегавала прадстаўнікоў на вышэйзгаданую пражскую канферэнцыю, а таксама ў сваёй працы кіравалася не толькі статутам зацверджаным Латгальскім акруговым судом, але таксама статутам менскай "Бацькаўшчыны" з часоў існавання БНР. У выніку вобшуку ў справаводстве Даўгаўпілскага і Лудзенскага аддзелаў "Бацькаўшчыны" і ў сакратара таварыства М. Іванова следчыя знайшлі статут "старой" "Бацькаўшчыны". Увагу следчых звярнуў факт, што ў адным з лістоў П. Крачэўскага І. Краскоўскаму (12 снежня 1923 г.) Даўгаўпілс называўся істотным асяродкам "беларускага фронту" побач з Вільняй, Прагай і Коўнам, а ўсе беларускія нацыянальныя сілы заклікалі да аб'яднання ў адзіны фронт нацыянальнага змагання. Непакой следчых выклікаў факт, што І. Краскоўскі азнаёміў са зместам гэтага ліста іншых беларускіх дзеячаў (У. Корці, А. Якубецкага, П. Мядзёлку-Грыб, У. Пігулеўскага і П. Жэрдзі). Доказам віны мела быць, таксама, віншаванне таварыства "Бацькаўшчына" з гадавінай абвяшчэння БНР. У тэлеграме 24 сакавіка 1923 г., атрыманай з Прагі, было напісана: "*Святкуючы 25-е сакавіка, шчыра вітаем. Хай жыве Незалежная Непадзельная Беларусь!*"[163]. Апрача таго, увагу следчых звярнуў ліст А. Цвікевіча да І. Краскоўскага высланы на мяжы 1923 і 1924 гг., у якім аўтар прапанаваў дзеячам даўгаўпілскай "Бацькаўшчыны" далучыцца да беларускага вызвольнага руху. Дырэктар І. Краскоўскі азнаёміў са зместам гэтага ліста настаўнікаў беларускай гімназіі[164].

Такім чынам, бачна, што дзеячы БНР рабілі спробы ўцягнуць беларускі актыў Латвіі ў палітычную дзейнасць на карысць стварэння незалежнай беларускай дзяржавы. Яны разглядалі тамтэйшы беларускі нацыянальна-культурны рух як частку беларускай незалежніцкай працы. З пункту гледжання інтарэсаў урада БНР дадзеная стратэгія з'яўлялася адзінай слушнай, паколькі ў міжваенны час беларускія незалежнікі былі расцярушаныя па розных краінах, а адзіным сродкам далейшай барацьбы за беларускую справу было ўтрыманне жывых кантактаў паміж асяродкамі беларускага жыцця ў розных кутках свету. Ідэйным злучвом гэтых кантактаў была ідэя нацыянальнага і дзяржаўнага адраджэння бацькаўшчыны. Беларускае замежжа з'яўлялася натуральным палітычным і дэмаграфічным заплеччам непрызнаных на міжнароднай арэне ўладаў БНР і крыніцай новых прыхільнікаў ідэі змагання за яе. Прынамсі частка латвійскіх беларускіх дзеячаў была гатовая да ўдзелу ў гэтым змаганні. Аднак не ўсе латвійскія беларусы падзялялі такую пазіцыю. Супраць палітызацыі беларускага нацыянальна-культурнага жыцця

---

[163] *Беларускі працэс у Латвіі*, "Голас беларуса" 1925, № 2 ад 20 чэрвеня, с. 3–4.

[164] T. Błaszczak, I. Matiash, D. Michaluk, *Iwan Kraskowski (1880–1955). W służbie Białorusi i Ukrainie*, Białystok 2019, s. 177–178.

выступіў У. Корці, які лічыў, што трэба засяродзіцца толькі на культурнай працы і падтрымліваць культурныя адносіны з іншымі арганізацыямі ў Латвіі, а не за мяжой. Пасля абмеркавання было вырашана адказаць на вышэйзгаданы ліст А. Цвікевіча, што грамадска-палітычныя кантакты таварыства "Бацькаўшчына" з урадам БНР немагчымыя, бо паводле статута арганізацыя займаецца толькі культурнай працай. Нягледзячы на гэта, латвійскія ўлады з трывогай ставіліся да ўдзелу (нават у якасці прыватных асоб) латвійскіх беларусаў у дзейнасці пад штандарам адраджэння беларускай дзяржаўнасці. Насцярогу латвійскага боку ўзмацнялі словы У. Корці падчас допыту: кожны беларускі дзеяч у Латвіі марыць пра незалежнасць Беларусі. Латвійскі бок не мог не ведаць, што многія кіраўнікі латвійскіх беларусаў у нядаўнім мінулым належалі да беларускіх нацыянальных партый (К. Езавітаў – да БПСФ, Я. Краскоўскі – да БПНС, А. Якубецкі і П. Мядзёлка-Грыб – да БПСР). Пры гэтым апошняя трымала сувязь са сваім мужам Тамашом Грыбом, які жыў у Празе і быў вядомы эсэраўскімі поглядамі. Яшчэ адзін беларускі эсэр Алесь Карабач на пачатку 1920-х гг. наведаў Латвію і сустрэўся з І. Краскоўскім і П. Мядзёлкай-Грыб[165].

Незадаволенасць прадстаўнікоў латвійскай дзяржавы кантактамі мясцовых беларусаў з дзеячамі БНР была зразумелай. Акрамя страху перад пагрозай страты тэрытарыяльнай цэласнасці існавалі іншыя рацыянальныя падставы, якія змушалі Латвію займаць такую, а не іншую пазіцыю ў дачыненні БНР. У міжваенны час пытанне незалежнай беларускай дзяржавы (на несавецкім грунце) лічылася справай неактуальнай на міжнародным парадку дня. Версальска-рыжскі лад, які запанаваў пасля 1921 г., не прадугледжваў існавання БНР. Латвія як беніфіцыяр гэтага ладу была зацікаўленая ў захаванні замацаванага ім статусу, парушэнне якога магло выклікаць шэраг непрадказальных пагроз і турбуленцый як звонку, так і ўнутры краіны. Дэмакратычная латвійская дзяржава шанавала правы беларускай меншасці гарантуючы ёй захаванне культуры і ідэнтычнасці ў межах шырокай нацыянальна-культурнай аўтаноміі, але выступала супраць уцягвання яе грамадзян у палітычную гульню, мэтай якой было змаганне супраць суседніх краін (Польшчы і СССР) за беларускую незалежнасць.

Кантакты латвійскіх беларусаў з эміграцыйнымі структурамі БНР былі прадметам увагі не толькі латвійскай дзяржавы, але і ўлад БССР. Апошнія намагаліся выкарыстаць іх для вырашэння ўласных палітычных задач. Гаворка ішла аб тым, каб дыскрэдытаваць урад БНР у вачах лідараў латвійскіх беларусаў. Больш за тое, Менск разлічваў, што мясцовыя прасавецкія

---

[165] К. Казачёнок, *"Белорусский процесс" в Латвии: обвинение, оправдание, наказание*, "Латыши и белорусы: вместе сквозь века. Сборник научных статей", ред. М.Г.Королёв, Минск 2012, с. 36.

дзеячы дапамогуць бальшавікам у змаганні з эміграцыйнымі палітычнымі прадстаўніцтвамі, канкурэнтнымі да Савецкай Беларусі. Галоўная роля ў гэтым адводзілася К. Езавітаву, што кантактаваў як з прадстаўнікамі БССР, так і з незалежніцкай беларускай палітычнай эміграцыяй. Восенню 1925 г. Менск вырашыў выкарыстаць беларускага дзеяча, каб паўплываць на настроі палітыкаў БНР. У гэты час група прэм'ера А. Цвікевіча (дзяржаўны сакратар У. Пракулевіч, дзяржаўны кантралёр Л. Заяц) пры чынным удзеле ЦК КП(б)Б рыхтавала 2-ю Усебеларускую канферэнцыю. Савецкі бок разлічваў, што гэта прывядзе да поўнай ліквідацыі структур БНР і прызнання эмігрантамі "чырвонага" Менска адзіным нацыянальна-культурным і дзяржаўна-палітычным цэнтрам беларускага народа, на які мусіў бы арыентавацца ўвесь беларускі рух па-за межамі Беларускай ССР. 14 жніўня 1925 г. ЦК КП(б)Б зацвердзіў умовы правядзення канферэнцыі, якую планавалася склікаць у нямецкай сталіцы. Дзеля адпаведнай апрацоўкі беларускіх эмігрантаў з Менска трасай праз Варшаву і Прагу ў Берлін скіраваліся прадстаўнікі БССР – Зміцер Жылуновіч і Міхась Чарот. Савецкі бок разлічваў, што пазіцыі прасавецкіх дзеячаў узмоцніць К. Езавітаў, які збіраўся ўзяць удзел у канферэнцыі як прадстаўнік латвійскіх беларусаў. Але некаторыя савецкія прадстаўнікі скептычна ставіліся да яго ўдзелу. Сябра Калегіі НКЗС Фёдар Ратштэйн пісаў савецкаму ўпаўнаважанаму прадстаўніку СССР у Латвіі Аляксей Чарных, што ў Менску не цалкам давяраюць латвійскім беларусам, таму крыху баяцца іх прысутнасці на канферэнцыі[166].

Тым не менш, К. Езавітаў увайшоў у кантакт з пражскімі беларусамі і пачаў збор дэлегацыі. 3 верасня 1925 г. з яго ініцыятывы кіраўніцтва таварыства "Беларуская хата" разгледзела пытанне пра ўдзел прадстаўнікоў арганізацыі ў працы 2-й Усебеларускай канферэнцыі[167]. Управа падтрымала прапанову і выказала жаданне, каб падчас канферэнцыі былі "*разгледжаныя і ўстаноўленыя спосабы зносін і ўзаемнай дапамогі сярод беларусаў на прасветна-культурным шляху іх жыцця*"[168]. 8 кастрычніка было вырашана, што ў Берлін ад імя таварыства "Беларуская хата" паедзе Ян Тэтар, якому было даручана ўсталяваць сувязь з іншымі беларускімі асяродкамі дзеля ўзаемадапамогі ў культурна-асветнай працы[169].

---

[166] Д.А. Короткова, *Поиски союзника. Контакты советских дипломатов в Латвии с К.Б. Езовитовым в 1925–1926 гг.*, "Славянский мир в третьем тысячелетии" 2020, Том 15, № 1–2, с. 51–52.

[167] 22 жніўня 1925 г. К. Езавітаў пісаў сваім пражскім калегам, што месцам канферэнцыі будзе Берлін альбо Рыга. Ён таксама адзначаў: "*Пажадана, каб канферэнцыя гэта аказалася яшчэ паважнейшай, чым вядомая канферэнцыя пражская*". LVVA, 1826 f., 1 ap., 1004 l., 219 lp.

[168] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1007 l., 54 lp.

[169] Абранне Я. Тэтара як дэлегата на канферэнцыю было невыпадковым. Таварыства не мела сродкаў на камандзіроўку, таму Я. Тэтар быў адзіным, хто мог паехаць за ўласны кошт.

Латвійскія беларусы цікавіліся скліканнем канферэнцыі і намагаліся ўключыцца ў падрыхтоўку. Яны прапанавалі арганізатарам правесці яе ў часе калядных вакацый, паколькі меркавалася, што дэлегатамі з Латвіі будуць у асноўным настаўнікі. Спачатку планавалася, што дэлегацыя будзе складацца з 5 чал. Аднак у апошні момант міністр асветы Латвіі забараніў беларусам – дзяржаўным работнікам браць удзел у канферэнцыі[170]. 11 кастрычніка 1925 г. дэлегацыя латвійскіх беларусаў (К. Езавітаў, М. Дзямідаў – ад таварыства "Беларуская хата", Я. Тэтар – ад таварыства "Рунь") прыбыла ў Берлін і размясцілася з астатнімі ўдзельнікамі канферэнцыі ў "Хаўс Брандэнбург" (*August-Schaper-Straße 4*)[171].

Захаваліся звесткі пра ўдзел латвійскіх беларусаў у канферэнцыі, якая адбылася 12–16 кастрычніка 1925 г. К. Езавітаў быў абраны старшынём прэзідыума мерапрыемства. Праўда, ён не праявіў вялікай актыўнасці падчас працы канферэнцыі, а ў сваім выступе засяродзіўся на праблемах беларускай меншасці Латвіі[172]. Тым часам М. Дзямідаў ачоліў культурна-асветную

Аднак пазней Я. Тэтар стаў дэлегатам ад таварыства "Рунь", а "Беларускую хату" было даручана прадстаўляць М. Дзямідаву. LVVA, 1826 f., 1 ap., 1007 l., 59 lp.; LVVA, 1826 f., 1 ap., 1004 l., 214 lp.

[170] *2-я Беларуская Нацыянальная Канфэрэнцыя*, "Голас беларуса" 1925, № 14 ад 25 верасня, с. 1; *2-я Беларуская Нацыянальная Канфэрэнцыя*, "Голас беларуса" 1925, № 15 ад 9 кастрычніка, с. 1; *Беларусаў з Латвіі ня пушчаюць на Конфэрэнцыю*, "Голас беларуса" 1925, № 15 ад 9 кастрычніка, с. 3.

[171] *2-я Беларуская Нацыянальная Нарада*, "Голас беларуса" 1925, № 16 ад 30 кастрычніка, с. 1; Тамсама, 1925, № 17 ад 10 лістапада, с. 1.

[172] Аналізуючы ход берлінскай канферэнцыі, можна даведацца, што К. Езавітаў узяў удзел у дыскусіі наконт "крывіцкай акцыі" распачатай В. Ластоўскім і Я. Станкевічам і паставіўся да яе крытычна. Па гэтым пытанні канферэнцыя выдала рэзалюцыю, асудзіўшы гэтую акцыю і назваўшы яе шкоднай для беларускай справы. 14 кастрычніка К. Езавітаў агучыў даклад пра латвійска-беларускія дачыненні, у якім прадставіў сітуацыю беларускай меншасці і яе дасягненні на культурна-асветнай ніве. Ён адзначыў, што ў 1924 г. пад уплывам узбуйнення тэрыторыі БССР пачаўся наступ "шавіністычна-чыноўніцкіх колаў" на беларускую меншасць, што прывяло да беларускага працэсу. Выступоўца адзначыў, што, нягледзячы на апраўдальны вынік, антыбеларускія рэпрэсіі не спыніліся (выдаленні настаўнікаў-іншаземцаў, звальненні некаторых педагогаў, закрыццё гімназіі ў Лудзе). Ён сказаў, што гэта былі дзеянні па інерцыі ад расхістанай урадавай машыны. Разам з тым, К. Езавітаў падкрэсліў, што антыбеларускія выступы не адлюстроўваюць сапраўднай волі латышскага народа і латвійскія беларусы не трацяць надзеі на лепшае стаўленне да іх з боку новага ўрада, які хутка будзе сфарміраваны. Выступоўца дадаў, што латвійскія беларусы пераходзяць да працы эканамічнай і палітычнай, але не ведае, ці будуць створаны беларускія палітычныя партыі ці беларусы далучацца да латвійскіх партый, якія ўжо пачынаюць змагацца за галасы беларускага насельніцтва. Па выніках выступу ўдзельнік канферэнцыі прынялі рэзалюцыю, у якой канстатавалі наяўнасць у латвійскім грамадстве антыбеларускіх настрояў і не падзялілі надзеі К. Езавітава на змену латвійска-беларускіх адносін пасля стварэння новага ўрада, бо лічылі, што "*толькі арганізацыяй шырокіх мас беларускіх сялян і працоўных змогуць беларусы ў Латвіі павярнуць сабе свае*

секцыю і 15 кастрычніка зрабіў даклад пра становішча беларускай культурна-асветнай працы ў БССР, Заходняй Беларусі, Літве, Латвіі і ЧСР[173]. Галоўным момантам берлінскай канферэнцыі было прыняццё з прапановы А. Цвікевіча рашэння (15 кастрычніка 1925 г.) пра ліквідацыю ўрада БНР і прызнанне БССР адзіным цэнтрам беларускага адраджэння. Згодна з прынятай пастановай, усялякая барацьба супраць Савецкай Беларусі разглядалася як "*здрада справе вызваленчага беларускага руху*". У рэальнасці, аднак, савецкі бок толькі часткова дасягнуў сваёй мэты, бо замест поўнай ліквідацыі палітычных структур БНР адбыўся іх раскол, у выніку якога адпала значная частка дзейных сяброў. Супраць прызнання Менска цэнтрам беларускага адраджэння выступілі эсэры (Я. Мамонька), якія вызнавалі прынцып: ні Масквы, ні Варшавы. Старшыня Рады БНР П. Крачэўскі і яго намеснік В. Захарка таксама не прызналі рашэнняў канферэнцыі, звяртаючы ўвагу на яе нелегітымнасць. Савецкія дыпламаты ў Рызе канстатавалі, што К. Езавітаў на канферэнцыі "*трымаў сябе цудоўна і значная частка ў справе правядзення рэзалюцыі канферэнцыі падае на яго долю*"[174]. Імаверна, яны мелі на ўвазе тое, што латвійскі беларус падтрымаў прапанову А. Цвікевіча пра стаўленне да БССР як да беларускага цэнтра. Праўда, падчас галасавання па вышэйзгаданай рэзалюцыі К. Езавітаў устрымаўся[175]. У адрозненне ад іншых былых дзеячаў БНР, ён не скарыстаўся правам вярнуцца ў БССР[176]. Пасля вяртання ў Рыгу К. Езавітаў на старонках газеты "Голас беларуса" даводзіў слушнасць прасавецкай лініі А. Цвікевіча, называючы стаўку на Менск "цвярозай пастаноўкай пытання". Дзеяч пераконваў, што беларусам не варта чакаць разумення і дапамогі ў справе нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ніадкуль, апроч "рэвалюцыйнага ўсходу"[177]. Пры гэтым ён лічыў

нарушаныя правы". *2-я Беларуская Нацыянальная Нарада*, "Голас беларуса" 1926, № 1(19) ад 10 сакавіка, с. 2.

[173] *2-я Беларуская Нацыянальная Нарада*, "Голас беларуса" 1926, № 2 ад 25 сакавіка, с. 2.

[174] А. Вабішчэвіч, *"Але ж шлях да свабоды старонка праложа!"* [у:] *Сыны і пасынкі Беларусі*, рэд. С. Барыс, Менск 1996, с. 332.

[175] *2-я Беларуская Нацыянальная Нарада*, "Голас беларуса" 1926, № 5 ад 10 траўня, с. 2.

[176] Магчымасць вяртання ў Савецкую Беларусь групе А. Цвікевіча давала пастанова ЦК КП(б)Б ад 22 кастрычніка 1925 г., якая месяц пазней рашэннем СНК БССР была пашырана на ўсіх былых дзеячаў БНР.

[177] У адным са сваіх артыкулаў прысвечаных вынікам берлінскай канферэнцыі К. Езавітаў пісаў: "*Савецкія ўлады рашуча сталі на грунт падтрымкі нацыянальных культур. Беларусы атрымалі магчымасць надзвычайна шырокага развіцця свае нацыянальнае культуры і эканамічнага дабрабыту. Урад Савецкае Беларусі запраўды зрабіўся беларускім урадам. Адчынілсія тысячы беларускіх школ, некалькі вышэйшых школ, беларускае выдавецтва дайшло да небывалага расквіту, тэрыторыя Савецкай Беларусі ўвесь час паступова павялічваецца (...) дзяржаўныя ўстановы становяцца ўсё больш і больш нацыянальна-беларускімі як па сваім персанальным складзе, гэтак і па мове, бо пераход на беларускую мову ва ўсіх установах абвешчаны абавязковым*

праціўнікаў арыентацыі на БССР групай "рамантыкаў" якія "ўсё яшчэ вераць у альтруізм Антанты"[178].

Нягледзячы на тое, што пасля берлінскай канферэнцыі ўлады БНР перасталі быць істотным чыннікам у палітыцы бальшавікоў, беларуская незалежніцкая эміграцыя працягвала існаваць. На выгнанні дзейнічаў Прэзідыум Рады БНР, які захаваў адданасць Акту 25 Сакавіка. Эмігранты-незалежнікі па-ранейшаму былі стрэмкай у воку "чырвонага" Менска. У гэты час К. Езавітаў выконваў ролю своеасаблівага савецкага сувязнога, які кантактаваў з дзеячамі БНР на эміграцыі ды інфармаваў іх пра поспехі савецкай палітыкі на Бацькаўшчыне. Адначасова ён мусіў тлумачыць сваім паплечнікам на Захадзе, чаму прыхільна ставіцца да Савецкай Беларусі. У адным з лістоў да амерыканскіх беларусаў ён пісаў: "*Для нас, латвійскіх беларусаў, Менск гэта тая дзяржава, якая можа за нас па праву радства ўступіцца, калі нас задужа будуць ціснуць. Менск для нас – культурны цэнтр. Мы на яго глядзім і ягонымі культурнымі здабыткамі жывём і дыхаем. Свядомасць*

і многія з устаноў ужо зусім перайшлі на беларускую мову (...) Усё гэта разам узятае, а таксама і поўная свядомасць таго, што ніякія іншыя сілы ў цэлым свеце не жадаюць і не хочуць дапамагчы беларускаму народу ў яго нацыянальна-культурным і эканамічным адраджэнні, – змусілі найбольш цвярозых беларускіх палітычных дзеячоў вызнаць, што ў Савецкай Беларусі ўтварыўся сапраўдны цэнтр сучаснай беларускай адраджэнчай працы. Вызнаўшы вялікую ролю Менска ў Беларускім Адраджэнні трэба было, лагічна разважаючы, прызнаць і другое, трэба было прызнаць, што барацьба, у сучасны момант, з Менскам і ўсялякія авантуры, скіраваныя супроць Менска, пагражаюць існаванню галоўнейшага цэнтра беларускага нацыянальнага адраджэння. А таму ніякіх авантур супраць Менска не павінна быць, а хто іх павядзе, дык той будзе, свядома, ці несвядома, але сапраўдным здраднікам беларускага нацыянальна-адраджэнчага руху". Адраджэнец, *Адгукі 2-й беларускай нацыянальнай нарады ў беларускім грамадзянстве*, "Голас беларуса" 1926, № 1(19) ад 10 сакавіка, с. 1.

[178] Беларускі дзеяч наступным чынам характарызаваў спадзяванні на іншыя сілы, акрамя БССР: "*Вось гэткая цвярозая пастаноўка пытання шмат каму, аднак, не спадабалася. Не спадабалася яна перш-найперш польскім шавіністам, якія ўбачылі, што беларусы ўсё больш цверазеюць і адхіляюцца ад Польшчы; не спадабалася гэта польскім дэфензіўным агентам, тыпу Паўлюкевічам і Верніхоўскім; не спадабалася яна тым беларускім палітычным дзеячам, што працуюць у Літве за грошы літоўскага ўрада (гэта і зразумела, бо яны сваёй думкі не маюць, а глядзяць на ўсё вачыма сваіх сучасных гаспадароў, – хрысціянскіх дэмакратаў), не спадабалася гэткая ацэнка пытання і беларускім палітычным рамантыкам, якія ўсё яшчэ вераць у тое, што 'вось прыйдзе добры пан – ён нас усіх рассудзіць'. Апошняя група беларускіх рамантыкаў складаецца з беларускай эміграцыі, якая ўсё яшчэ верыць у альтруізм Антанты, у пункты Вільсана і ў тое, што вось надойдзе нейкая шчаслівая для беларусаў гадзіна, і тады ўсё само сабой зробіцца, а яны, з дапамогай Еўропы і Амерыкі, павернуцца на Беларусь (...) Аднак фактаў адкінуць няможна. Менск сапраўды зрабіўся цэнтрам беларускага адраджэння. Беларусы сапраўды павінны клапаціцца, каб польская, ці якая-колечы іншая варожая рука не разбурыла гэтага цэнтра*". Адраджэнец, *Адгукі 2-й беларускай нацыянальнай нарады ў беларускім грамадзянстве*, "Голас беларуса" 1926, № 1(19), с. 1.

таго, што ў Менску ідзе вялікая нацыянальна-беларуская праца, памагае нам ваяваць за свой нацыянальны твар і ваяваць супраць распачатай тутака латышызацыі. Апрача таго, мы – латвійскія грамадзяне і не маемо права ўмешвацца ў палітычна-дзяржаўнае жыццё суседняе дзяржавы, хаця-ж і роднай нам па нацыянальнаму прызнаку. Наша агляданне на Менск духова лучыць нас з нашым беларускім народам, і, апрача таго, стрымлівае тых, хто тутака хацеў бы нас праглынуць. Крытыка Менску панізіла б нашыя настроі, адбівала бы волю да змагання. Дык не нам лаяць Менск"[179]. Аўтар пераконваў, што крытыкай Савецкай Беларусі мусяць займацца беларускія дзеячы ў Чыкага і Празе, але не ў Латвіі і Польшчы, якія вельмі моцна залежаць ад Менска ў культурным і маральным сэнсе. З гэтай мэтай ён прапаноўваў пачаць выданне бюлетэня, які мог інфармаваць амерыканскую і еўрапейскую думку як пра дасягненні, так і пра заганы БССР[180]. На думку К. Езавітава, місія беларускай эміграцыі – адыгрываць ролю "пугі", *якая "падсцёбвала б беларусізацыю і рабіла бы спакойную дзелавую крытыку*", выконваючы *"ролю апазіцыі, апынуўшайся дзеля большае незалежнасці па-за межамі дзяржавы"*[181]. Ён лічыў, што: "*Гэтым эміграцыя моцна дапаможа інтэнсіфікацыі працэсу беларусізацыі, гэтым падтрымае не толькі старых беларускіх дзеячаў у Менску, але надасць нацыянальнае рашучасці і маладому беларускаму пакаленню, якое выхоўваецца (...) у Савецкай Беларусі*"[182].

Пасля паездкі ў БССР на мовазнаўчую канферэнцыю ў 1926 г. К. Езавітаў інтэнсіфікаваў ліставанне з беларускімі дзеячамі ў Чэхаславакіі і ЗША. Латвійскі беларус дзяліўся ўражаннямі ад пабачанага ў БССР. Напрыканцы 1926 г. ён накіраваў лісты Я. Варонку і Я. Чарапуку (лістапад 1926 г.), М. Вяршыніну, П. Крачэўскаму і В. Захарку (17 снежня 1926 г.), у якіх пераконваў адрасатаў, што беларусізацыя ў БССР сапраўды адбываецца, а яе кірунак рашучы, паслядоўны і нязменны[183].

---

[179] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., Ліст К. Езавітава да Язэпа Варонкі і Янкі Чарапука, 16 снежня 1926 г.

[180] Тамсама.

[181] Тамсама.

[182] Тамсама.

[183] У лісце пражскім беларусам К. Езавітаў пісаў: "*Беларуская праца ў Менску сапраўды вядзецца, і вядзецца шырока. Трымаюць яе ў сваіх руках і вядуць старыя нашы беларускія дзеячы-адраджэнцы, якія нямала ўсе згрупаваліся ў Інбелкульце (...) Гэтыя ж сілы працуюць у выдавецтве і выкладаюць лекцыі беларусазнаўства. Наагул яны манапалізавалі ў сваіх руках беларушчыну і гэтага ад іх ніхто не можа адабраць. Каб ахапіць усе адказныя пасады ва ўсіх камісарыятах не хапае сваіх сілаў (...), дык шмат сілаў новых, мне незнаёмых, найбольш лезуць жыдкі, але шмат і маладых беларусаў, якія гутараць усюль па-беларуску. Напрамак на беларусізацыю вельмі моцны. Да апошняга года перашкаджала беларусізацыі тое, што партыйны апарат і, што самае галоўнае, партыйная маса ў пераважнай большасці складалася не*

з беларусаў, а з жыдоў, расейцаў і латышоў. Беларускія камуністы, якіх у партыі ў 1922 годзе было ўсяго 20%, зразумелі, што пачынаць трэба з таго, каб накачаць партыю беларускімі элементамі, каб працэнт беларусаў быў большы. І вось у працягу 1923, 1924, 1935 і 1926 года пайшла барацьба за масу, а знача і за ўладу ў нетрах самой партыі беларускіх камуністаў. Беларусы пачалі павялічваць лічбу сваіх сяброў, латышы пагналі ў партыю сваіх, жыды сваіх і расейцы сваіх. У працяг гэтых чатырох гадоў партыя павялічылася па ліку ў 5 разоў. Латышы хутка сагналі ў партыю ўсё, што змаглі, і далей ужо папаўняць не маглі. Выдыхаліся і расейцы. І цяперака ў партыі 55% беларусаў. Знача абсалютная большасць" (LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 258 lp. Ліст К. Езавітава да М. Вяршыніна, П. Крачэўскага і В. Захаркі, 17 снежня 1926 г.). Тым часам у лісце да чыкагскіх беларусаў К. Езавітаў адзначаў: "*Беларуская праца сапраўды вядзецца. Вядуць яе нашы старыя адраджэнцы, якія немаль усе сабраліся ў апалітычнай установе Інбелкульце (…), а таксама шмат і новых сілаў. На пасадах кіраўнікоў музеяў, бібліятэк, тэатраў, дзяржаўнага выдавецтва таксама сядзяць беларусы са старых дзеячоў (...) Лектары беларускае мовы па вышэйшых школах і тэхнікумаў – таксама з гэтых сілаў. Каб ахапіць усе адказныя пасады не хапае нашых старых людзей, а таму па розных камісарыятах шмат людзей, мне незнаёмых, з якіх мо толькі адна пятая беларусы, а рэшта – невядомыя людзі (...) Аднак і яны пачынаюць ужо патроху гутарыць па-беларуску. Напрамак на беларусізацыю моцны, але сіл для яго правядзення было мала, бо ў кампартыі было дужа мала беларусаў, у 1923 годзе ўсяго 20% (...) Цяперака ў партыйнай масе беларусаў больш 55%. Барацьба ідзе далей (...) Барацьба паміж беларусамі камуністамі і камуністамі іншых нацыянальнасцяў ідзе далей і штодня завострываецца. Гэта надзвычайна важны для нас момант вельмі старанна замоўчваецца камуністамі, бо для іх гэткая фракцыйнасць па нацыянальным прынцыпе зусім ужо складаная справа*" (LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., Ліст К. Езавітава да Язэпа Варонкі і Янкі Чарапука, 16 снежня 1926 г.). З амерыканскімі беларусамі К. Езавітаў дзяліўся ўражаннямі ад візіту ў Менск у лістападзе 1926 г.: "*Даражэнькія Язэп і Янка, па старой памяці і старым сяброўстве, а таксама ў імя вялікае беларускае справы, якой мы служым шчыра, сумленна і кожны ў меры свайго разумення, хачу падзяліцца з вамі тымі думкамі, якія ў мяне паўсталі ў Менску, а таксама і тымі ўражаннямі, якія я асабіста атрымаў. 1. Беларуская праца запраўды вядзецца. Вядуць яе нашы старыя адраджэнцы, якія немаль усе сабраліся ў апалітычнай установе Інбелкульце (Я. Лёсік, Я. Колас, Я. Купала, Б. Эпімах-Шыпіла, А. Смоліч, Некрашэвіч, А. Цвікевіч, Грыневіч, Бядуля, Ігнатоўскі і інш.), а таксама і шмат новых сілаў. На пасадах кіраўнікоў музеяў, бібліятэк, тэатраў, дзяржаўнага выдавецтва таксама сядзяць беларусы са старых дзеячоў (Дыла, Ждановіч, Красінскі, Жылуновіч, Васілеўскі, Брадоўскі). Лектары беларускае мовы па вышэйшых школах і тэхнікумах – таксама з гэтых сілаў. 2. Каб ахапіць усе адказныя пасады не хапае нашых старых людзей, а таму па розных камісарыятах шмат людзей мне незнаёмых, з якіх толькі мо адна пятая беларусы, а рэшта – невядомыя людзі, у большасці жыды. Аднак і яны пачынаюць ужо патроху гутарыць па беларуску. 3. Напрамак на беларусізацыю моцны, але сіл для яго правядзення было мала, бо ў кампартыі было дужа мала беларусаў, у 1923 годзе ўсяго 20%. За апошнія тры гады беларускія камуністы ўпарта змагаліся за павелічэнне беларускага % у партыі. Жыды, латышы і расейцы таксама цягнулі ў партыю сваіх, але масы ў іх меншыя, а таму першымі адсталі латышы, немаль усіх сваіх, каго было можна, яны ўключылі ў партыю, затым выдыхліся расейцы, нарэшце пачалі адставаць і жыды. Цяперака ў партыйнай массе беларусаў больш 55%. Барацьба ідзе далей. Прапарцыйна ўзросту беларускага крыла ў масах партыі, раслі ўплывы беларускіх камуністаў і лік іх ў цэнтральных і раённых органах партыі. 4. Барацьба паміж беларускімі камуністамі і камуністамі іншых*

нацыянальнасцяў ідзе далей і штодня больш завострываецца. Гэта надзвычайна важны для нас момант вельмі старанна замоўчваецца камуністамі, бо для іх гэткая фракцыйнасць па нацыянальным прынцыпе зусім ужо складаная справа. Мне прыйшлося гутарыць з некаторымі старымі нашымі дзеячамі і старымі беларускімі камуністамі-нацыяналістамі (імені іх называць не магу, бо ўзялі з мяне слова: для іх гэта было б вельмі небяспечна, кал-б як-колечы выпадкова аб гэтым дайшло да Менска), і вось іхняя думка: 'Напрамак на беларусізацыю безумоўна шчыры і моцны, але трэ ўвесь час працу ў гэтым кірунку падштурхіваць. Ініцыятыва падштурхівання зразумела павінна ісці і ідзе ад камуністаў-беларусаў, але, каб мець права для штодзённых напамінанняў і змагання ў гэтым кірунку, трэба мець дакументальныя аснаванія, бо інакш можаш праслыць 'нацыянал-шавіністам' і страціць спачатку ўплыў, а потым мо і партыйны білет. Вось тут абавязак беларускае іміграцыі штодзённа тыкаць у нос усякія недахопы ў гэтым кірунку. Да эміграцыі ўсе ў Беларусі вельмі прыслухоўваюцца і кожная разумная, канкрэтная зацемка дае грунт дамагацца папраўкі заўважанай у эміграцыі справы. Дзеля гэтай мэты беларуская эміграцыя павінна па-за межамі пратрымацца як мага далей. Яна павінна быць пугай, якая падсцёбвала бы беларусізацыю і рабіла бы спакойную дзелавую крытыку. Яна выконвала бы ролю апазіцыі, апынуўшайся дзеля большае незалежнасці за-межамі дзяржавы. Эміграцыя не павінна быць вялікай па лічбе, бо патрэбны сілы і на Беларусі, але моцнай па сваіх інтэлектуальных сілах. Галоўная зброя эміграцыі – цвярозая крытыка, без істэрычных словаізвяржэній. Тады праца яе будзе мець надзвычайна важныя ўплывы на Менскую працу. Але, адзіны варунак, эміграцыя павінна стаяць на моцным незалежніцка-беларускім грунце і не даваць нікому на свеце поваду вінаваціць яе ў тым, што яна ідзе на паваду ў сусветнай буржуазіі. Эміграцыя павінна быць дэмакратычна-сацыялістычнай і толькі з пункту гледжання нацыянальных спраў беларускага народа і з пункту гледжання сацыялістычнага накіроўваць сваю крытыку. Інакш яна будзе абвешчана капіталістычным прыхваснем, або прыхваснем Антанты і голас яе значэння ніякага мець не будзе'. Мне не падкрэслівалі, але і сам я добра зразумеў, што далучэнне Гомельшчыны змагло прайсці толькі таму, што ў мінулым годзе аб гэтым успомніла 2-я Беларуская Нарада ў Берліне. Калі б якая-колечы нарада ўспомніла цяперака аб Смаленшчыне, і каб аб гэтым падхапіла інастранная прэса, дык чарговым этапам было падняццё кампаніі за далучэнне гэтых абшараў і, безумоўна, гэта кампанія была-б выйграна на карысць беларусаў. З гэтага бачыш, што перад беларускай эміграцыяй стаяць 2 галоўныя і дужа важныя ў працягу некалькіх бліжэйшых гадоў задачы: быць 'падсцёбваючай пугай', а значa многа і рэальна крытыкаваць, друкуючы ў прэсе адпаведныя стацці і час ад часу збіраючыся на канферэнцыі, на якіх патрэбна канстатаваць, што добра і што кепска (гэта ўжо роля нацыянальнага, незалежнага ад улады судзілішча, 'беларускі сенат'); папулярызаваць за межамі беларускую ідэю і культуру (у гэтым пункце можна нават часам супрацоўнічаць з Інбелкультам). Гэтым эміграцыя моцна дапаможа інтэнсіфікацыі працэсу беларусізацыі, гэтым падтрымае не толькі старых беларускіх дзеячаў у Менску, але надасць нацыянальнае рашучасці і маладому беларускаму пакаленню, якое выхоўваецца і ўжо выхавалася за апошнія гады ў Савецкай Беларусі. 5. Аб асабістых уражаннях і назіраннях не пішу, чытайце 'Голас беларуса', там я падрабязна крок за крокам дзялюся ўсімі назіраннямі і стараюся быць зусім аб'ектыўны. Зразумела, што таго, што пісана ў гэтым лісце, я даць у прэсу не магу, ды і вы ні ў якім разе не пашырайце. Цяперака аб тым, хто павінен узяць на сябе ініцыятыву крытыкі, канферэнцый і наагул самае рашучае і балючае 'пугі'. Мне здаецца, што ні беларусы пад Польшчай, ні беларусы пад Латвіяй, ні беларусы пад Літвой, а толькі можа быць Чыкагская беларуская эміграцыя. Чаму так. А вось чаму. Беларусы пад Польшчай

не могуць лаяць і нават асабліва крытыкаваць Менск, бо ўсё, што тамака робіцца, нязмерна лепшае за тое, як жывуць і працуюць беларусы ў Польшчы. Апрача таго, не можна лаяць Менску і таму, што Менск павінен быць месцам, куды павінны цягнуцца летуценні ўсяго беларускага народа з-пад Польшчы. У Менску і злучэнні з Менскам адзіны ратунак Заходняе Беларусі. Трэба ўзгадоўваць волю да змагання за далучэнне да Менска і ніяк не можна гэтага элементарнага пачуцця разлагаць і ўскладняць якімі-колечы іншымі пачуццямі і настроямі, лаючы Менск. Няможна ўстрывожваць, затрымоўваць імкненне да Менска ўсялякімі перасярогамі аб магчымых у Менску расчараваннях. Лозунг для народных масаў павінен быць ясны і кароткі, як вайсковая каманда: 'На Менск'. Для нас, латвійскіх беларусаў, Менск гэта тая дзяржава, якая можа за нас па праву радства ўступіцца, калі нас задужа будуць ціснуць. Менск для нас – культурны цэнтр. Мы на яго глядзім і ягонымі культурнымі здабыткамі жывём і дыхаем. Свядомасць таго, што ў Менску ідзе вялікая нацыянальна-беларуская праца, памагае нам ваяваць за свой нацыянальны твар і ваяваць супраць распачатай тутака латышызацыі. Апрача таго, мы – латвійскія грамадзяне і не маемо права ўмешвацца ў палітычна-дзяржаўнае жыццё суседняе дзяржавы, хаця ж і роднай нам па нацыянальным прызнаку. Наша агляданне на Менск духова лучыць нас з нашым беларускім народам, і, апрача таго, стрымлівае тых, хто тутака хацеў бы нас праглынуць. Крытыка Менска панізіла б нашыя настроі, адбівала бы волю да змагання. Дык не нам лаяць Менск. Тое-ж самае можна сказаць і аб Літве. Тутака трэба памятаць яшчэ і аб тым, што ліцвіны хацелі бы забраць сабе Вільню і Горадню, дык безаглядачнае арыентаване на Літву гэта кірунак на новы падзел Беларусі. На каго ж падае гістарычная роля 'пугі'. Ясна: на Чыкага і Прагу. Прычым Чыкага я стаўлю на першае месца, бо Прага была і будзе, а Чыкага новы фактар, і прытым на амерыканскай глебе. Да Амерыкі вельмі прыслухоўваюцца ў Маскве і таму пойдуць на спатканне многім менскім патрэбам і вымаганням. Апрача таго, ідэя Урада БНР без тэрыторыі і грошай мала зразумела за граніцай і мала ўплывова ў Беларусі (там пытаюцца: 'Што зрабіў Урад за 8 год свайго існавання за межамі'). Задачы Прагі і Чыкага ў 1927–28 годзе склікаць чарговы беларускі Кангрэс. На кангрэсе трэба адмежавацца ад чарнасоценных колаў, стварыць Нацыянальны Камітэт, які час ад часу выпускаў бы бюлетэні і інфармаваў бы амерыканскую і еўрапэйскую прэсу аб дасягненнях і недахопах, крытычныя стацці трэба абавязкова пасылаць у Менск, каб яны тамка чыталіся (цяперака, напрыклад, на ўвесь Менск ёсць усяго 1 экзэмпляр 'Беларускае трыбуны' і 1 экзэмпляр 'Замежнае Беларусі', якія пасланы мной у Інбелкульт. Бюлетэняў Рады БНР і БС-Р ніхто не толькі не чытаў, але і не бачыў). Кангрэс можа быць і ў Амерыцы, а можа быць і ў Еўропе. Важны не лік удзельнікаў, а добрая інфармацыя аб ім. Рэзалюцыі трэба падрыхтаваць загадзя і добра іх апрацаваць і ўзважыць. Матэрыялы для крытычных стацей можна чэрпаць з радавай прэсы. Газеты радавыя будуць вам ахвотна высылацца рэдакцыямі ў абмен за вашы выданні. Ёсць магчымасць атрымоўваць некаторыя матэрыялы з Менска, бо там надрукаваць іх няможна, а для беларускае справы надрукаванне іх патрэбна. Зразумела, што ў такіх выпадках няможна рабіць ссылак на аўтараў, а таксама і на шлях, якім матэрыялы вамі атрыманы. Гэтае пісьмо я спачатку пасылаю ў Чыкага, а потым копію яго я, па атрыманні адказу з Чыкага, пашлю ў Прагу. На пісьмо прашу падрабязны адказ з высвятленнем, ці рэальна склаўшыяся абставіны працы ў Амерыцы дазваляюць развіць такую працу, каб Чыкага мог узяць на сябе гістарычную ролю 'пугі', ці летуценні аб гэткай 'пузе' толькі і астануцца летуценнямі. Пару слоў аб 'Беларускай Трыбуне'. Яна павінна, на мой погляд, або павялічыць лік беларускага матэрыялу, каб больш выразна зрабіцца беларускаю газетаю, або павялічыць агульную інфармацыю і гэткім чынам ператварыцца на агульна-каланіяльную газету, якая б была на

Акцыя К. Езавітава, скіраваная на адбельванне вобразу Савецкай Беларусі ў вачах беларускіх эмігрантаў скончылася паразай. Апошнія захоўвалі скептыцызм што да шчырасці бальшавіцкай беларусізацыі. Да крытыкаў прасавецкай арыентацыі лідара латвійскіх беларусаў належаў В. Ластоўскі, які тады знаходзіўся ў Коўне. У лісце (31 студзеня 1926 г.) маладому латвійскаму беларусу А. Сальцэвічу былы прэм'ер БНР пісаў: "*Што Езавітаў сціснуты цяпер, то гэта вынік яго памылковай тактыкі. Беларусам (Крывічам) нельга займацца бальшавіцкай прапагандай у Латвіі. Гэта праступак і перад Беларусамі (Крывічамі) якія жывуць у Латвіі і перад Латвійскай Дзяржавай і перад людской парадачнасцю. Латвія аднеслася да Беларусаў (Крывічоў) як прыяцель, даючы магчымасць арганізаваць школы, а ёй за гэту прыязнасць паспрабавалі адплаціць няўдзячнасцю. Так паміж чэсных людзей не робяць (...) Крывічы (Беларусы) у Латвіі павінны быць самай лаяльнай меншасцю – вось правільны шлях працы ў Латвіі. Паспрабаваў бы Езавітаў павесці падобна апазіцыйную работу ў Саветах, то яго бы не 'ціснулі', а даўно бы згналі ў Чэка ці проста вывялі бы ў 'расход'. Дык вось, вы маладыя і павінны зразумець, што ў Латвіі мы павінны весьці нацыянальна усведамляючую працу, а не рэвалюцыйна-камуністычную, якая ў выніку можа і нас, і нашых суседзяў завесці ў Маскоўскую турму народаў*"[184]. Парадокс быў у тым, што ўжо менш як праз паўтара года пасля гэтых слоў іх аўтар па асабістым запрашэнні А. Чарвякова пераехаў у БССР, а К. Езавітаў на старонках "Голасу беларуса" горача вітаў гэты ўчынак, называючы яго пачаткам новай "гістарычнай эпохі" ў беларускім адраджэнскім руху[185].

За кантактамі К. Езавітава з беларускімі незалежнікамі сачылі савецкія прадстаўнікі ў Латвіі. Яны разлічвалі праз яго скантактавацца з амерыканскімі беларусамі, каб дасылаць ім сваю прэсу. Савецкі бок аналізаваў стаўленне лідара латвійскіх беларусаў да іншых незалежнікаў за мяжой. Паводле словаў А. Ульянава, К. Езавітаў лічыў, што "*Прага зусім мёртвая група: грошы яны атрымліваюць ад чэхаў, і пакуль гэта падтрымка будзе, яны яшчэ механічна не разваляцца. Бадунова звар'яцела (між іншым, на палавой аснове). Мамонька спіўся. Грыб боўтаецца і не ведае, за што яму ўзяцца. Езавітаў напісаў Зайцу,*

расейскай мове, але з беларускім назовам і абслугоўвала бы ўсе нацыянальнасці і стала на камерцыйны грунт. Што да напрамку, дык гэта заўсёды больш відней на месцы, ды, апрача таго, напрамак можна зразумець з выказаных мной вышэй думак. На астачу – пасылаю Вам, вывезены з Менска верш аднаго з вядомых беларускіх паэтаў і дужа прашу абавязкова яго надрукаваць, зразумела без ссылак на крыніцу атрымання, бо інакш гэтым знішчыце магчымасць атрымання новых матэрыялаў. Маю надзею, што ўбачу яго ў наступным нумары 'Беларускае Трыбуны'. Цісну абодвум руку і вітаю" (LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 251–254 lp., Ліст К. Езавітава да Я. Варонкі і Я. Чарапука, 26 снежня 1926 г.).

[184] LCVA, f. 368, ap. 1, b. 36, l. 5–6.

[185] *Вацлаў Юстынавіч Ластоўскі выехаў у Менск*, "Голас беларуса" 1927, № 56, с. 1.

каб ён прыехаў у Латвію, бо ён ураджэнец Люцынскага павета, і мы б тут вялі працу, але той з гонарам заявіў, што ён 'Дзяржаўны кантралёр БНР' і не лічыць магчымым здрадзіць гэтаму званню. Гучыць з гонарам, але недарэчна. З палякамі Езавітаў у вельмі вострых адносінах, бо яны лічаць яго адным з барацьбітоў супраць іх, і другім Коўна, з Коўнам ён, відаць, сувязь мае"[186]. Складана зараз верыфікаваць праўдзівасць гэтых сцвярджэнняў, але вядома, што адносіны паміж беларускімі дзеячамі ў той час не былі пазбаўленыя антаганізмаў.

Істотны эпізод супрацоўніцтва паміж латвійскімі беларусамі і прадстаўнікамі БНР тычыўся ўладкавання беларускай моладзі з Латвіі ў чэхаславацкія ВНУ. Як ужо адзначалася, у першыя гады незалежнасці Латвіі выхаванцам беларускіх гімназій складана было трапіць у латвійскія вышэйшыя навучальныя ўстановы, таму яны шукалі альтэрнатыўныя шляхі атрымання вышэйшай адукацыі. Першым была магчымасць выправы маладых латвійскіх беларусаў у Чэхаславакію, урад якой даў грошы на падтрымку студэнтаў з Усходняй Еўропы, у тым ліку беларусаў. Улетку 1921 г. урад ЧСР прызначыў 20 стыпендый для навучання беларусаў у вышэйшых школах. З беларускага боку справу курыравала Беларуская грамада ў Празе і асабіста Мікалай Вяршынін і Пётра Крачэўскі. Падчас паездкі ў Прагу ў 1921 г. К. Езавітаву ўдалося атрымаць згоду на вылучэнне стыпендый для некалькіх латвійскіх беларусаў[187]. З дапамогай М. Вяршыніна ўдалося ўладкаваць на вучобу ў Чэхаславакіі першую партыю з Латвіі[188]. У лютым 1922 г. у Прагу паехалі Рыгор Сакалоў і Пётр Цвяткоў. Першы быў залічаны на тэхнічна-будаўнічы факультэт, а другі – на хімічны. Вядома, што з 24 беларускіх студэнтаў, якія ў красавіку 1922 г. навучаліся ў ВНУ Чэхаславакіі, пяцёра паходзіла з Латвіі. У хуткім часе ўзнікла патрэба ў большай колькасці стыпендый, паколькі ў 1922 г. у Даўгаўпілскай беларускай гімназіі адбыўся першы выпуск вучняў, якія жадалі працягваць асвету. У студзені 1922 г. Беларускі школьны аддзел накіраваў ліст Таварыству беларускай школы (ТБШ) у Вільні і рэктару Карлава ўніверсітэта, інфармуючы, што ў Латвіі ёсць група моладзі, якая хоча атрымаць вышэйшую асвету ў ЧСР. У сувязі з гэтым БША прасіў даць інфармацыю пра такую магчымасць[189].

---

[186] Цыт. пав.: В. Бароўская, *Алесь Ульянаў: старонкі жыцця (1901–1937)*, Менск 2025, с. 60.

[187] 8 верасня 1921 г. лідар латвійскіх беларусаў пісаў да А. Цвікевіча: "*Чакаю з Вільні дакументаў тых, каго яны хацелі направіць ў Пражскі Універсітэт. А пакуль што загатовіў толькі дакументы Дзвінчан і Дварчаніна. Хутка вышлю іх да цябе, каб ты паслаў Чэха-Славакам*". АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1212, 1517.

[188] Гэта былі: Караліна Гладкая (Рыга), Рыгор Сакалоў (Даўгаўпілс), Пятро Цвяткоў (Даўгаўпілс), Аркадзь Салаўёў (Даўгаўпілс) і Алена Жамяркова (Даўгаўпілс). LCVA, f. 366, ap. 1, b. 10, l. 6, 7.

[189] LVVA, 2125 f., 5 ap., 104 l., 4, 5 lpp.

Тым часам К. Езавітаў працягваў шукаць па асабістых каналах шляхоў выправіць моладзь на вучобу ў ЧСР. 31 студзеня 1922 г. ён прасіў Беларускі школьны аддзел дапамагчы ўладкаваць ва ўніверсітэт у Празе Франца Клагіша, які да вайны быў студэнтам Пецярбургскага інстытута шляхоў зносін[190]. У ліпені 1922 г. дзеяч папрасіў у кіраўніцтва БША камандзіраваць яго ў Прагу дзеля ўладкавання чарговай групы беларускай моладзі ў Чэхаславакіі[191]. 15 ліпеня 1922 г. падчас пасяджэння Рады Беларускага школьнага аддзела было ўзнята пытанне пра тое, каб латвійскі ўрад выдаткаваў 20 стыпендый для здольных беларускіх студэнтаў у ВНУ Латвіі. У выпадку немагчымасці атрымаць стыпендыі было вырашана дамагчыся дзяржаўнай камандзіроўкі К. Езавітава ў Прагу, каб там дамовіцца пра стыпендыі ад чэхаславацкага ўрада. Аднак на гэта не знайшлося сродкаў у бюджэце[192].

У жніўні 1922 г. кіраўніцтва ТБШ інфармавала Беларускі школьны аддзел, што латвійскія беларусы могуць разлічваць на 10 стыпендый. Адначасова віленскія беларусы нагадвалі, што "*пасылаць трэба толькі нацыянальна свядомых кандыдатаў, узяўшы пісьменнае забавязанне*"[193]. 26 верасня 1922 г. БША звярнуўся да інспектара К. Езавітава з просьбай заняцца пошукам адпаведных кандыдатаў[194]. Справа выбару кандыдатаў была даручаная Даўгаўпілскаму аддзелу таварыства "Бацькаўшчына", якое разгледзела 23 заявы. У жніўні 1922 г. было абрана шэсць маладых беларусаў, а астатнім прапанавалі запісацца на настаўніцкія курсы і падаць дакументы на выезд налета[195]. Шасцёрка абраных складалася з асоб, якія праслухалі настаўніцкія курсы для педагогаў-практыкантаў, мелі добрыя вынікі па беларусазнаўстве ці скончылі беларускую гімназію. У гэты спіс трапілі: Франц Клагіш, Віктар Вальтар, Тамаш Васільеў, Ян Філатаў, Ян Калбека і Лявон Мадзалеўскі[196]. Апошні адмовіўся ехаць, а астатнія 19 жніўня 1922 г. звярнуліся да М. Вяршыніна з просьбай даць больш падрабязную інфармацыю пра ўмовы жыцця і навучання ў ЧСР[197].

---

[190] LVVA, 2125 f., 5 ap., 104 l., 1 lp.

[191] 4 ліпеня 1922 г. Езавітаў пісаў у Прагу: "*У гэтым і ў мінулым годзе вялікі лік беларускай моладзі пасканчалі ў Латвіі сярэднія школы. Большасць з іх хоча вучыцца далей, але не мае магчымасці зрабіць гэтага ў Латвіі, бо: 1) не ведае латышскую мову настолькі, каб слухаць курс вышэйшае школы, а затым, 2) не мае грошай, каб жыць у Рызе. Апошняя прычына найгоршая, бо паправіць яе мы не маемо сілаў*". LVVA, 2125 f., 5 apr., 42 l., 98 lp.

[192] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 107, л. 48; LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 3 lp.; LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 1–5 lpp.

[193] LVVA, 2125 f., 5 ap., 392 l., 58 lp.

[194] LVVA, 2125 f., 5 ap., 392 l., 65 lp.

[195] LVVA, 2125 f., 5 apr., 42 l., 176–177 lpp.

[196] LVVA, 2125 f., 5 apr., 38 l., 338 lp.

[197] Маладыя людзі пісалі ў лісце М. Вяршыніну: "*Залічаныя на стыпендзію ў Прагу і маючы жаданне як хутчэй адправіцца ў дарогу, мы, па радзе К.Б. Езавітава, просім Вас не адмовіцца*

Моладзь, скіраваная вучыцца ў Чэхаславакію, паходзіла ў асноўным з Даўгаўпілшчыны і Рыгі. Тым часам жыхары Лудзеншчыны падчас набораў у 1921 і 1922 гг. не браліся пад увагу праз адсутнасць "нацыянальна свядомых" кандыдатаў, бо Лудзенская беларуская гімназія толькі пачынала працу. Гэтым быў незадаволены К. Езавітаў, які сцвярджаў, што выправа ў Прагу прадстаўнікоў Лудзеншчыны будзе мець важнае маральнае значэнне для мясцовых беларусаў і спрычыніцца да ўзмацнення беларускіх настрояў у павеце. 6 верасня 1922 г. ён хадайнічаў перад Беларускім школьным аддзелам, каб паслаць у Прагу настаўніка Руднінскай школы Канстанціна Нікіфароўскага, які меў няскончаную вышэйшую адукацыю і праслухаў летнія курсы беларусазнаўства. Акрамя таго, ён прасіў БША паклапаціцца пра стыпендыі для жыхароў Лудзенскага павета Мігунова і Макарава, якія маглі б вывучыць беларускую мову ў Празе, знаходзячыся сярод беларусаў[198]. Пад уплывам К. Езавітава ў верасні 1922 г. кіраўніцтва Беларускага школьнага аддзела выказвала жаданне накіраваць у Чэхаславакію 1–2 жыхароў Лудзеншчыны, нават калі яны добра не ведалі беларускай мовы. Акрамя таго, кіраўніцтва БША лічыла, што гэта яно павінна займацца кваліфікацыяй кандыдатаў, а не таварыства "Бацькаўшчына"[199]. Апошняя прапанова не знайшла разумення К. Езавітава, які 12 кастрычніка 1922 г. пісаў кіраўніку БША, што перадача абавязкаў па наборы кандыдатаў Беларускаму школьнаму аддзелу немэтазгодная, бо гэта ўстанова знаходзіцца ў Рызе, а кандыдаты паходзяць з Латгаліі. Таму, на яго думку, наборам па-ранейшаму мусіла займацца даўгаўпілская "Бацькаўшчына"[200].

Пазней латвійскія беларусы не пераставалі рабіць захады па ўладкаванні моладзі ў чэхаславацкія ВНУ. На пасяджэнні Педрады Даўгаўпілскай беларускай гімназіі 5 ліпеня 1923 г. было вырашана даручыць дырэктару І. Краскоўскаму весці перамовы з чэхаславацкімі беларусамі пра атрыманне ад урада ЧСР згоды на навучанне чарговай групы выпускнікоў[201].

адказаць на некалькі пытанняў. Перш усяго мы не ведаем, ці залічаны мы ў студэнты Вышэйшай Школы і ці можам мы атрымаць паперы із Прагі аб нашым прыняцці. Калі так, дык мы вельмі просім Вас як хутчэй прыслаць усе патрэбныя паперы, бо без іх мы не зможам выехаць. Таксама нам невядома, куды звяртацца па нашым прыбыцці ў Прагу. Як там спачатку абсталявацца. Як хутка пасля прыбыцця можна атрымаць стыпендзію? Таксама, калі ласка, адпішыце, як там жыццё з матэр'яльнага боку. Ці выдаюць студэнтам-стыпендыстам вопратку? Абутак? Як абстаіць справа с падручнікамі? (...) Ці не можна атрымаць праграмы Інстытута? Калі можна, будзьце ласкавы, вышліце". LCVA, f. 366, ap. 1, b. 24, l. 4–5.

198 LVVA, 2125 f., 5 ap., 414 l., 1 lp.

199 LVVA, 2125 f., 5 apr., 42 l., 169 lp.

200 LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 28 lp.

201 У пастанове Педрады гімназіі чытаем: "*Дзеля таго, што выяўляецца магчымасць спынення выдачы стыпендый Чэшскім урадам тым студэнтам, якія пасылаюцца з Латвіі, што*

Аднак Міністэрства асветы Латвіі адмовілася фінансаваць камандзіроўку І. Краскоўскага як іншаземца, а ехаць за ўласны кошт ён не пажадаў. Педрада гімназіі 16 жніўня 1923 г. вырашыла выслаць поштай у Прагу дакументы асоб, якія жадалі выехаць у ЧСР, з просьбай прызначыць ім стыпендыі[202]. Нягледзячы на матэрыяльныя цяжкасці, у 1923 г. І. Краскоўскаму ўсё ж удалося наведаць Прагу і даведацца, што ўрад ЧСР вылучыў беларусам 16 стыпендый, у тым ліку латвійскім – 7, з магчымасцю павелічэння колькасці месцаў. Кандыдатаў павінна была адбіраць педрада Даўгаўпілскай беларускай гімназіі паводле наступных крытэрыяў: поспехі ў навучанні, стан нацыянальнай свядомасці і матэрыяльнае становішча. 25 верасня педрада прапанавала кандадатаў: Людмілу Краскоўскую, Алеся Махноўскага, Куцкага, Яна Карнавухава, Елізавету Мілоўскую, Харлапа, Марыю Каспяровіч, Кацярыну Антонаву, Пятра Герасімава, Уладзіміра Бараноўскага, Аляксандра Паўлава і Трыфана Авяр'янава[203].

Аднак восенню 1923 г. Беларуская грамада ў Празе адмовіла выхаванцам Даўгаўпілскай гімназіі ў стыпендыях праз адсутнасць месцаў. Гэта выклікала абурэнне даўгаўпілсцаў, якія палічылі гэта праявай дыскрымінацыі латгальскіх беларусаў у параўнанні з кандыдатамі з іншых краін. У адказ П. Крачэўскі (18 кастрычніка 1923 г.) тлумачыў, што адмова не з'яўляецца праявай дыскрымінацыі, а вынікам таго, што ўрад ЧСР прызначыў беларусам толькі 16 стыпендый, тым часам, як у Прагу прыехала ажно 30 кандыдатаў з Заходняй Беларусі. Ён пераконваў, што гэтых людзей нельга выслаць назад у Польшчу, дзе беларусы церпяць пераслед. Дзеяч раіў сябрам з Латгаліі супакоіцца і пачакаць наступнага туру стыпендый[204].

з свайго боку можа шкодна адбіцца на становішчы гімназіі, – пастанавілі дэлегаваць у Прагу кіраўніка гімназіі гр. Краскоўскага дзеля выяснення справы і перагавораў на месцы з адпаведнымі асобамі". LVVA, 2067 f., 1 ap., 367 l., 19 lp.

[202] LVVA, 2067 f., 1 ap., 367 l., 20 lp.

[203] LVVA, 2067 f., 1 ap., 367 l., 46 lp.

[204] Варта цалкам прывесці ліст П. Крачэўскага: "*Зусім згодзен з вашым незадаваленнем, але як бачу з паперы Грамады ў Празе і ўспамінаючы нашу гутарку з Міністрам закардонных спраў у Празе, прысутным быў пры якой грам. Краскоўскі (што Міністэрства ў прыёме студэнтаў не лічыцца з % адносінамі нацыянальнасцей наогул, а толькі з фактам прысутнасці ў данны момант ліку эмігрантаў), я, пасля таго, як раптам з'явілася з Вільні трыццаць чалавек студэнцкай моладзі, якая ніякім чынам не можа быць выкінута назад у Польшчу, разумею Міністэрства, якое тым часам затрымало выпіску стыпендыятаў з Латгаліі. Віны ў гэтым няма ні нашай, ні Вяршыніна, бо стыпендый маецца 16, а сядзяць і чакаюць ужо прыехаўшых 30. Ваша абурэнне незразумела, а вывад, што адмаўленне Латгальскім беларусам у стыпендыях мае адмаўленне ў патрэбнасці беларускай працы ў Латвіі наогул – нелагічна. Калі ж дадаць да гэтага Вашу заяву: што наша далейшая праца ў Латвіі можа весціся толькі ў тым выпадку, калі Латгальскія беларусы будуць роўнымі сынамі адной беларускай сям'і, то атрымліваецца малюнак злой волі кампраметаваць не толькі асоб, але і справу, бо розніцы паміж беларусамі*

Вылучэнне стыпендый маладым латвійскім беларусам выклікала адмоўную рэакцыю з боку чэхаславацкіх грамадзян, якія вучыліся ў ВНУ Латвіі. У траўні 1925 г. консульства Чэхаславакіі ў Рызе паінфармавала пра гэта МЗС ЧСР. У лісце звярталася ўвага на тое, што ўлады ў Празе прызначаюць стыпендыі студэнтам-беларусам, у той час як чэхаславацкія юнакі і дзяўчаты, якія вучацца ў Латвіі, не атрымліваюць дапамогі[205].

Нягледзячы на вышэйзгаданыя інцыдэнты, у 1923 і 1924 гг. латгальскія беларусы не перасталі трапляць на вучобу ў Чэхаславакію. У асноўным гэта былі асобы, выбраныя ў папярэднія гады, якія з розных прычын не змаглі адразу прыехаць у Прагу. 31 кастрычніка 1923 г. у Беларускай грамадзе ў Празе зарэгістраваліся тры чарговыя студэнты-беларусы з Латвіі, якія паступілі ў Карлаў універсітэт. Гэта былі Ян Карнавухаў (Медычны факультэт), Аляксандр Паўлаў (Тэхнічны факультэт) і Міхал Луцкі (Фізіка-матэматычны факультэт)[206]. У 1924 г. навучанне на Філалагічным факультэце Карлава ўніверсітэта распачала Людміла Краскоўская[207]. Здараліся адзінкавыя выпадкі, калі вучні былі гатовыя вучыцца за мяжой за ўласны кошт. Напрыклад, 27 кастрычніка 1924 г. у Беларускі школьны аддзел звярнуўся

ўсей этнаграфічнай Беларусі ніхто і ніколі не рабіў. Я думаю, што і Вашы кандыдаты на Чэшскія стыпендыі, прымаючы пад увагу нязмерны гвалт і нацыянальны ўціск у Віленшчыне і Горадзеншчыне палякаў, заставіўшый іх пехатой уцякаць у Прагу, самі адмовяцца ў імя той самай роўнасці, аб якой Вы пішаце, ад сваіх вакансій і ў спакойных варунках жыцця ў Латвіі, пачакаюць сваёй чаргі ў недалёкім будучым, каб атрымаць тое, на што яны спадзяюцца. Ставіць культурна-нацыянальную справу ў Латвіі выключна ў залежнасць ад прыёму, ці не прыёму на пражскія стыпендыі немагчыма, бо гэта будзе не культура, а транспартное бюро Дзвінск – Прага. Вы не забывайце, што апрача % соотношэнія Заходняй Беларусі (3 мільёны) і Латгаліі (70 тысяч), за студэнтамі із Віленшчыны і Горадзеншчыны, выносячымі ўвесь цяжар барацьбы з Польшчай, маецца яшчэ і рэвалюцыйна-палітычны стан, якога мы ў перыяд найцяжэйшага змагання за наша адраджэнне выкінуць з балансу не можам, чаго ў Вышых студэнтаў няма. Вы із той самай роўнасці не можаце сказаць сваім братам із Віленшчыны і Горадзеншчыны: вядзіце барацьбу, сядайце ў турмы, нават умірайце, но не займайце нашых месц у Празе, бо мы хочам спакойна весці культурную працу. Адпаведнасць на сябе я прымаю і не маю права адмовіцца ад яе, але і з свайго боку прашу так лёгка не скідаць адпаведнасці і з сваёй галавы, бо я лічу і лічыў Вас не чыноўнікам толькі Міністэрства прасветы, а адпаведнымі грамадскімі і палітычнымі працоўнікамі і дзеячамі ў Латвіі. Справа ідзе не аб выключэнні Вашых студэнтаў з пражскіх стыпендый, а аб магчымасьці Вашых студэнтаў пачакаць следуючага прыёму, чаго не могуць зрабіць тыя, якія ўжо прыехалі ў Прагу з Віленшчыны. На днях мы ўсе збіраемся ў Прагу для нашай агульнай працы, дзе і гэта пытанне будзе пастаўлена на парадак дзенны". LCVA, f. 582, ap. 1, b. 4, l. 88.

[205] *Дакументы і матэрыялы па гісторыі беларускай эміграцыі ў Чэхаславацкай Рэспубліцы (1918–1939)*, укл., прадм., камент.: А. Буча, Менск 2020, с. 203–204.

[206] NA, F. 908, Karton 306.

[207] T. Błaszczak, I. Matiash, D. Michaluk, *Iwan Kraskowski (1880–1955). W służbie Białorusi i Ukrainie*, Białystok 2019, s. 172.

студэнт Сымон Дарафееў, які пісаў: "*Я, Сямён Дарафееў, жадаючы прадоўжыць вучэнне ў вышэйшай школе Пражскага ўніверсітэта і скончыўшы сярэднюю школу ў Дзвінскай Урадавай Сярэдняй Школе, прашу Беларускі Аддзел Прасветы дапамагчы мне ў атрыманні патрэбных дакументаў, як замежнага пашпарту і чэшскай візы. Адукацыю ў вышэйшай школе я буду прадаўжаць на свой кошт і аніякіх падтрымак ад Чэшскага ўніверсітэту прасіць не буду*"[208].

Выезды беларускай латвійскай моладзі на навучанне ў ЧСР адбываліся да сярэдзіны 1925 г. 13 ліпеня 1925 г. К. Езавітаў прасіў у П. Крачэўскага і В. Захаркі некалькі стыпендый для выпускнікоў Даўгаўпілскай і Лудзенскай гімназій[209]. З вялікай верагоднасцю можна сказаць, што гэта была апошняя спроба выправы тутэйшых беларусаў у Чэхаслакавію. Паўплываў на гэта беларускі працэс у Латвіі, падчас якога следчыя цікавіліся, хто і за чые грошы выправіў беларускую моладзь у ВНУ Чэхаславакіі[210]. Праўда, у наступныя гады таксама назіраліся спробы беларускага актыву Латвіі накіроўваць сваіх выхаванцаў па навуку ў ЧСР. У чэрвені 1926 г. дырэктар Даўгаўпілскай беларускай гімназіі С. Сахараў інфармаваў пражскіх суродзічаў, што сёлета сярэднюю асвету атрымала 7 маладых беларусаў, якія жадаюць атрымаць вышэйшую адукацыю. Ён прасіў даць інфармацыю пра магчымасць паступлення ў Карлаў універсітэт[211]. 23 лістапада 1926 г. да С. Сахарава звярнулася былая вучаніца гімназіі Эмілія Рэгут, якая навучалася ў Пражскай політэхніцы. Яна пісала, што паходзіць з незаможнай сям'і і ёй не хапае на жыццё тых сродкаў, якія яна атрымала ад бацькоў. Дзяўчына хацела звярнуцца да ўраду ЧСР па дапамогу, але для гэтага ёй патрэбна было пасведчанне аб тым, што яна добра вучылася ў гімназіі і з прычыны незаможнасці не магла паступіць у Латвійскі ўніверсітэт[212].

---

[208] LVVA, 2125 f., 5 ap., 415 l., 1 lp.

[209] У лісце К. Езавітава чытаем: "*Усіх напраўляць да Вас не будземо, але чалавек з пяцьшэсьць было б добра ўстроіць, асабліва з гімназіі Люцынскае, бо, па-перш, ніводзін вучань гэтае гімназіі яшчэ не быў прыняты ў Празе (сёлета толькі першы выпуск), а па-другое, гэта сапраўды нашы гадунцы, а не нахваташы з бору ды з сосенкі ўсялякі элемент, як гэта часамі здаралася*". ГАРФ, ф. 5875, оп. 1, д. 11, л. 433.

[210] *Беларускі працэс у Латвіі*, "Голас беларуса" 1925, № 16 ад 30 кастрычніка, с. 2.

[211] LVVA, 2067 f., 1 ap., 364 l., 104 lp.

[212] Вось урывак з ліста: "*Высока Паважаны Пан Дырэктар! Выбачайце, што я вас турбую. Но справа ў тым, што я цяпер знаходжусь у Празе і вучусь у тэхніцэ на хімічным. Гэты аддзел такі дарагі, што грошы, якія мне прысылаюць бацькі, мне не хапае. Дзеля таго хачу прасіць у Чэшскім Міністэрстве дапамогі. Каб мне не адказалі ў Чэскім Міністэрстве, прашу ласкава Вас выдаць мне Пасведку аб беднасці, яка будзе мець вялікае значэнне пры маёй просьбе. Пасведка можа быць у такім духу: 'Што Эмілія Рэгут скончыла досць добра Беларускую Дзяржаўную Гімназію ў Дзвінску і хоча атрымаць вышэйшую асвету, но так як паступіць*

Цяжка вызначыць колькасць латвійскіх беларусаў, якія трапілі на навучанне ў ЧСР. Знаўца гісторыі беларусаў Чэхаславакіі Сяргей Кнырэвіч налічыў іх 25[213]. Імаверна, спіс няпоўны.

Захавалася няшмат звестак пра знаходжанне маладых латвійскіх беларусаў у Празе. Матэрыяльнае становішча студэнтаў было складаным і цалкам залежала ад дапамогі чэхаславацкага ўраду. Адсутнасць грошай не дазваляла наведаць бацькоў падчас вакацый. Пра гаротнае становішча латвійскіх беларусаў сведчыць факт, што іх прозвішчы фігуруюць у спісах тых, каму патрабавалася матэрыяльная дапамога[214]. Лёсам маладых беларусаў цікавіўся К. Езавітаў, які падтрымліваў сувязь з кіраўніцтвам Аб'яднання беларускіх студэнцкіх арганізацый (АБСА)[215]. Ён клапаціўся пра нацыянальнае выхаванне тых, каго выслаў у Прагу. У адным з лістоў да пражскіх студэнцкіх актывістаў ён адзначаў, што беларуская моладзь з Латвіі яшчэ не зусім нацыянальна свядомая, таму прасіў заапекавацца ёй: "*Нашыя хлопцы, што прыедуць адсюль, яшчэ мала свядомыя. Падбадзёрце іх. Дапамажыце ім. Але не адхіліце іх ад сябе і не пастарайцеся адштурхнуць іх ад сябе занадта вялікімі патрабаваннямі ці нецярплівасцю да іх несвядомасці. Яны штотыдня будуць пісаць сюды лісты і ад таго, 'як' Вы іх спаткаеце будзе залежаць адношанне іх радзіны, а за імі і ўсяе Дзвінску і Латгаліі да нас і да нашае справы ў Латвіі*"[216].

Час паказаў, што прадстаўнікі латвійскіх беларусаў, якія навучаліся ў ЧСР, паступова ўключыліся ў грамадскую і культурную працу на чужыне. Некаторыя належалі да АБСА. Іншыя (Тамаш Васільеў, Франц Клагіш, Яўген Салаўёў) далучыліся да моладзевай арганізацыі "Беларускія сокалы"[217]. У жніўні 1925 г. на старонках віленскай "Крыніцы" з'явілася зацемка пра тое, што ў Празе створана ініцыятыўная група па арганізацыі гуртка студэнтаў-беларусаў з Латвіі. Планавалася, што мэтай гуртка будзе "прыгатаваць сяброў да будучае культурнае працы сярод сваіх родзічаў у Латвіі ў сужыцці й супрацоўніцтве з суграмадзянамі латышамі"[218]. Адсутнасць іншых

Рыжскім Унівэрсітэце немагчыма дзеля таго, што во-первых цяжкі конкурс, а па-другое не дазваляюць матэрыяльныя абставіны". LVVA, 2067 f., 1 ap., 364 l., 178 lp.

[213] Гэта былі: Барткевіч Аляксей, Вальтар Віктар, Васільеў Яўген, Васільеў Тамаш, Віткевіч Вера, Герасімаў Пётр, Жэмерава Алена, Жэмераў Павел, Каплан Берта, Клагіш Франц, Конанаў Аляксандр, Краскоўская Людміла, Кроін Леў, Ленаў Георгі, Лугоўскі Сяргей, Мартынава Зоя, Мілоўская (Дыліс) Альжбета, Нібур Уладзімір, Паўлаў Аляксандар, Салаўёў Аркадзь, Салаўёў Яўген, Шавялькоў Леанід, Шыла Яўген, Цвяткоў Пятро, Якаўлева Наталля. Звесткі атрыманыя ад Сяргея Кнырэвіча (ліст ад 13.12.2024 г.).

[214] LCVA, f. 366, ap. 1, b. 10, l. 10, 11.

[215] LCVA, f. 366, ap. 1, b. 13, l. 11, 13.

[216] LCVA, f. 366, ap. 1, b. 18, l. 1–3.

[217] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 177, л. 22, 35.

[218] *Дакументы і матэрыялы па гісторыі беларускай эміграцыі ў Чэхаславацкай Рэспубліцы (1918–1939)*, укл., прадм., камент.: А. Буча, Менск 2020, с. 215.

інфармацый аб арганізацыі і дзейнасці гуртка дазваляе меркаваць, што справа яго стварэння не выйшла па-за межы планаў. Некаторыя маладзёны зарэкамендавалі сябе як нацыянальна свядомыя актывісты. Належыць узгадаць перадусім В. Вальтара, творчы талент якога праявіўся яшчэ ў студэнцтве. Іншы латвійскі беларус Аркадзь Салаўёў, скончыўшы Акадэмію мастацтваў, застаўся ў Празе, дзе працаваў мастаком-пейзажыстам. Тым часам, яго брат Яўген вярнуўся ў Латвію[219].

Некаторыя латвійскія беларусы ў Чэхаславакіі траплялі ў непаразуменні і супярэчлівыя сітуацыі. Восенню 1922 г. у Празе з'явіўся Язэп Любчын, які, спасылаючыся на рэкамендацыю кіраўніка Беларускага школьнага аддзела, хацеў атрымаць стыпендыю як латвійскі беларус. Беларуская грамада ў Празе звярнулася ў БША, каб пацвердзіць гэтыя звесткі. С. Сахараў пасведчыў, што Я. Любчын раней наведаў БША і заявіў, што ён беларус. Кіраўнік Беларускага школьнага аддзела паспрыяў яму ў справе выезду ў Прагу на навучанне, але даць рэкамендацыю на атрыманне стыпендыі адмовіўся[220]. Асобнай увагі заслугоўвае выпадак П. Цвяткова, які прыехаў у Прагу ў верасні 1921 г. для ўдзелу ў Першай Усебеларускай канферэнцыі. Восенню 1921 г. ён стаў студэнтам хімічнага аддзялення Пражскай політэхнікі. Паводле ўспамінаў Вінцэнта Жук-Грышкевіча, гэты чалавек быў "*адумыслова прысланым палітруком з заданнем наварачвання на камунізм беларускіх студэнтаў у Празе*"[221]. У чэрвені 1922 г. П. Цвяткоў уступіў у Камітэт па забеспячэнні адукацыі рускіх студэнтаў у ЧСР (КЗАРС). З сакавіка 1923 г. пачаў дзейнічаць марксісцкі гурток, створаны з ініцыятыые П. Цвяткова. Ён каардынаваў дзейнасць студэнтаў-марксістаў. Пятро Цвяткоў і яго прыхільнікі рабілі акцэнт на праблеме сацыяльнага вызвалення беларускага народа, падкрэсліваючы кіроўную ролю пралетарыяту, і нігілістычна ставіліся на нацыянальнага пытання. У пачатку 1925 г. пры ўдзеле П. Цвяткова былі арганізаваныя тры гурткі па вывучэнні праблем марксізму, адзін з якіх ён ачоліў сам. У 1926 г. выехаў у Польшчу, дзе яго след губляецца[222].

ЗША. Асабістыя знаёмствы К. Езавітава зрабілі магчымымі кантакты латвійскіх беларусаў суродзічамі за акіянам. У першую чаргу гэта былі Язэп Варонка і Янка Чарапук. Абодва дзеячы жылі ў Чыкага і кіравалі Беларуска-амерыканскай нацыянальнай асацыяцыяй[223]. На пачатку і ў сярэдзіне 1920-х гг.

---

[219] В. Целеш, *Беларускія масткі ў Латвіі: 1920–1990*, Рыга 2020, с. 89.

[220] LVVA, 2125 f., 5 ap., 104 l., 25 lp.

[221] Р. Жук-Грышкевіч, *Жыццё Вінцэнта Жук-Грышкевіча*, Toronto 1993, с. 48.

[222] А. Буча, *Дзейнасць беларускіх прасавецкіх арганізацый у Чэхаславакіі ў 1920-я гады*, "Przegląd Środkowo-Wschodni" 2019, № 1, с. 449–508.

[223] В. Кіпель, *Беларусы ў ЗША*, Менск 2017, с. 131.

К. Езавітаў атрымліваў ад іх грашовую падтрымку: на перадвыбарчую кампанію ў латвійскі парламент у 1922 г., а пазней – на выданне газеты "Голас беларуса". Акрамя таго, К. Езавітаў прасіў заакіянскіх сяброў дапамагаць арганізацыйнымі парадамі і высылаць літаратуру[224]. У часе беларускага працэсу ў Латвіі Беларускі нацыянальны камітэт штата Іліной с (ЗША) сабраў 3000 даляраў на патрэбы зняволеных беларускіх дзеячаў. У сярэдзіне 1920-х гг. чыкагскія беларусы прапанавалі К. Езавітаў пераехаць настала ў ЗША. Апошні не выключаў такой магчымасці, але цікавіўся, як уяўляецца яго жыццё ў Амерыцы і якія перспектывы яго чакаюць[225]. Ёсць звесткі, што ў 1924 г. Я. Чарапук перадаў К. Езавітаву не менш за 1 тыс. даляраў. Паводле савецкіх крыніц, гэтыя грошы амерыканскі беларус даслаў В. Ластоўскаму, які ў Гданьску перадаў іх адрасату[226]. Аднак пасля Я. Варонка і Я. Чарапук спынілі фінансаванне яго дзейнасці. Прычынай былі прасавецкія настроі латвійскага беларуса. Сведчыць пра гэта ліст К. Езавітава А. Чарвякову (3 студзеня 1927 г.), у якім чытаем: "*БНК у Чыкага патрабуе, каб я змяніў напрамак 'Голасу' і пачаў лаяць Менск. Гэта ставіцца варункам дапамогі. Я на гэта не згаджаюся. Дык яны пачалі друкаваць сваю ўласную газету ў Чыкага. Магчыма, што з зачыненнем майго 'Голасу' чыкагская 'Трыбуна' будзе адзінаю беларускаю газетаю за межамі Беларусі*"[227]. Аднак нават пасля гэтага лідар латвійскіх беларусаў не кінуў пераконваць амерыканскіх сяброў змякчыць сваю пазіцыю адносна Савецкай Беларусі. Напрыканцы 1920-х г. К. Езавітаў дасылаў Я. Варонку нумары "Савецкай Беларусі" і быў гатовы распаўсюджваць сярод землякоў за акіянам іншую прэсу з БССР[228].

---

[224] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 56, л. 169. Ёсць падставы меркаваць, што на просьбу С. Сахарава К. Езавітаў прасіў амерыканскіх беларусаў дапамагчы ўтрымліваць вучнёўскі інтэрнат у Даўгаўпілсе (НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 35, л. 5).

[225] Кастусь Езавітаў лічыў, што яго выезд з Латвіі магчымы, бо "*беларусы ў Латвіі ўжо – існуючы факт, з якім прымірыліся і ворагі. Для аканчальнага прымірэння мо варта выехаць таму, хто гэты факт стварыў і рашуча і востра бараніў*". LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l.

[226] У лісце А. Ульянава ў прадстаўніцтва КПЗБ (жнівень 1927 г.) чытаем: "*Неабходна, каб Ластоўскі звязаўся з Чарапуком (...) каб той пацвердзіў, што ў 1924 г. ім быў дасланы Кастусю адзін букет (1000 дал.) кветак праз Ластоўскага, які ў Данцыгу перадаў Кастусю, і дзесяць букетаў кветак перададзены таксама ў той самы час, таксама адтуль жа, бо Кастусь на яго спысылаецца*". Цыт. пав.: В. Бароўская, *Алесь Ульянаў: старонкі жыцця (1901–1937)*, Менск 2025, с. 159.

[227] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 184 lp.

[228] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 214 lp., Ліст К. Езавітава да Я. Варонкі, 30 кастрычніка 1929 г. Яшчэ на пачатку 1930-х г. К. Езавітаў падтрымліваў сувязь з заакіянскімі беларусамі. У адным з лістоў Я. Варонкі (23 сакавіка 1933 г.) чытаем: "*Як там у цябе? Бачу – многа ты выдаў беларускіх друкаў! Аб некаторых я не ведаў (...) Добра, братка, робіш. Мы павінны ўсе свае сілы аддаць выдавецтву й школе. Не падабаецца мне толькі фармат тваіх брашур. Але трэба, канешне, выдаваць і брашуры*" (HI, Collection K. Yezovitov, Ліст Я. Варонкі да К. Езавітава, 23 сакавіка 1933 г.).

Справамі латвійскіх беларусаў цікавіліся таксама іншыя амерыканскія беларусы. У адказ на беларускі працэс сваю падтрымку латвійскім беларусам прапанаваў Камітэт абароны беларусаў-палітвязняў у Польшчы, які дзейнічаў у Чыкага. Кіраўнік апошняга шукаў інфармацыі пра ход працэсу і стаўленне да яго мясцовых сацыял-дэмакратаў[229]. У кастрычніку 1925 г. дзеяч гэтай арганізацыі Яўген Сямашка прасіў К. Езавітава дасылаць яму "Голас беларуса", а таксама паведаміць адрасы беларускіх палітычных вязняў у Латвіі, каб камітэт змог ахапіць іх сваёй дапамогай. У хуткім часе К. Езавітаў папрасіў Я. Сямашку выслаць 260 даляраў дапамогі[230]. Аднак з прычыны вялікай адлегласці і нешматлікасці беларускай дыяспары ў ЗША кантакты латвійскіх беларусаў з суродзічамі за акіянам мелі эпізадычны характар і ў асноўным былі вынікам асабістага знаёмства К. Езавітава з беларускім амерыканскім актывам.

Літва. Да найбольш інтэнсіўных замежных кантактаў належалі адносіны з беларускімі асяродкамі ў суседніх краінах – Літве і Польшчы. У выпадку гэтых краін можна казаць пра існаванне як прыватнага, так і інстытуцыйнага супрацоўніцтва. Беларусаў у Латвіі і Літве яднала падабенства лёсаў і праблем, з якімі мусілі змагацца. У міжваенны час Літва была адным з галоўных асяродкаў беларускага замежжа[231]. Да ліку найбольш актыўных дзеячаў беларускай меншасці ў гэтай краіне належылі В. Ластоўскі (да 1927 г.), Усевалад Боеў, Сымон Якавюк, Клаўдзій Дуж-Душэўскі і інш. У Літве існаваў шэраг беларускіх грамадскіх і культурна-асветных арганізацый. Нешматлікая група беларускай інтэлігенцыі была падзелена паводле палітычнай арыентацыі. У першай палове 1920-х гг. можна было заўважыць дзве плыні, якія выводзіліся з асяроддзя палітыкаў БНР: прасавецкую і пралітоўскую. На чале першай стаяў С. Якавюк, а другую ачольвалі В. Ластоўскі і К. Дуж-Душэўскі. Першую групу ўтрымліваў савецкі бок, яна мела шчыльныя кантакты з савецкімі дыпламатамі, а другая атрымлівала дапамогу ад літоўскага ўрада. В. Ластоўскі і К. Дуж-Душэўскі былі літоўскімі дзяржаўнымі чыноўнікамі і кіравалі Міністэрствам беларускіх спраў (МБС). У 1925 г. замест МБС быў створаны Беларускі цэнтр у Літве (БЦЛ). Да 1926 г. Коўна з'яўлялася значным цэнтрам выдавецкай дзейнасці,

---

[229] Э. Екабсонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [у:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 54.

[230] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l.,. 4 lp.; LVVA, 3235 f., 2 apr., 4635 l., 126 lp.

[231] Справа колькасці літоўскіх беларусаў з'яўляецца дыскусійнай. Паводле вынікаў адзінага ў Літве перапісу насельніцтва (1923 г.) беларусамі запісаўся толькі 4 421 чал. (0,22%). Тым часам беларускія аўтары і крыніцы падавалі іншыя лічбы: ад 25 да 45 тыс. чал. T. Błaszczak, *Białorusini w Republice Litewskiej 1918–1940,* Białystok 2017, s. 253–255.

якую праводзіў В. Ластоўскі. Ён выдаваў часопіс "Крывіч" (1923–1926 гг.), а таксама надрукаваў шэраг арыгінальных прац прысвечаных беларускай праблематыцы. Дачыненні паміж прасавецкай і пралітоўскай плынямі былі напружаныя, а пасля 2-й Усебеларускай канферэнцыі – варожыя[232].

Беларускімі справамі ў Літве цікавіўся К. Езавітаў, плёнам працы якога стала выданне кнігі "Беларусы ў Літве". Па сутнасці, гэта першая спроба сінтэтычнага апісання гісторыі беларускай меншасці ў краіне. Аднак К. Езавітаў цікавіўся не толькі мінулым, але і надзённымі праблемамі суайчыннікаў у Літве. Яму ідэйна была бліжэйшая прасавецкая плынь[233]. З ліставання паміж В. Ластоўскім і К. Езавітавым вынікае, што апошні пагаджаўся з тымі, хто вінаваціў былога прэм'ера ў празмернай пралітоўскасці[234]. Латвійскі беларус не верыў у поспех беларуска-літоўскага супрацоўніцтва дакараючы літоўцаў, што яны коштам беларусаў імкнуцца збудаваць Вялікую Літву (з беларускімі Горадняй і Беластокам), а да лёсу ўсходняй Беларусі абыякавыя[235]. Сваёй пазіцыі па "літоўскім пытанні" К. Езавітаў не памяняў і пазней[236]. Ён лічыў, што В. Ластоўскі заняў адносна літоўцаў службовую пазіцыю, якая "не да твару былому Старшыні Ураду БНР"[237]. Дзеяч таксама сцвярджаў, што В. Ластоўскі павінен засяродзіцца выключна на культурнай працы і дазволіць іншым займацца палітыкай[238].

---

[232] Гл. больш: T. Błaszczak, *Białorusini w Republice Litewskiej 1918–1940*, Białystok 2017.

[233] Аўтар крытычна ставіўся да шчырасці літоўскай дзяржавы ў дачыненні да мясцовых беларусаў. Ён заклікаў беларускіх актывістаў "не паўтараць памылак В. Ластоўскага" і іншых дзеячаў БНР, якія празмерна захапляліся альтруізмам літоўцаў, а шукаць падтрымкі сярод простага беларускага насельніцтва. К. Езавітаў, *Беларусы ў Літве*, Рыга 1932, с. 16.

[234] У адным з лістоў К. Езавітаў пісаў: "*Але самае галоўнае гэта вось што: ці Вы бачыце большага прыяцеля сабе асабіста і беларускаму народу ў Янінасе, чым у нас, беларускім грамадстве? Ці Вы адчытваецеся перад ім, ці перад беларусамі? Ці вы радзіцеся з ім, ці з намі? Вы добра ведаеце, што я Вам нязменны прыяцель асабісты, аднак грамадская праца вымагае адвагі дапытвацца сваіх асабістых прыяцеляў і нават крэўных аб іх грамадскім кірунку*". АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1622.

[235] К. Езавітаў, *Да арганізацыі беларускае нацыянальнае меншасьці у сучаснае Літве*, "Голас беларуса" 1926, № 6 ад 20 траўня, с. 1.

[236] У 1930-я гг. на старонках прэсы К. Езавітаў працягваў ставіць пад сумнеў магчымасць беларуска-літоўскага супрацоўніцтва. Ён дакараў ковенскія ўлады ў тым, што яны не дазваляюць беларусам культурна-асветнай аўтаноміі. У сувязі з гэтым К. Езавітаў заклікаў да перагляду беларуска-літоўскіх адносін (Адраджэнец, *Беларуская меншасьць у Літве ўсё яшчэ не атрымала ніводнае беларускае школы,* "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 7(24), с. 363–363). 14 лютага 1934 г. ён пісаў В. Захарку, што нікому з суседзяў не верыць, а толькі сабе; трэба штодзённая марудная ўпартая праца над нацыянальным сацыяльным і эканамічным усведамленнем (ГАРФ, ф. 5875, оп. 1, д. 11, л. 444).

[237] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1622.

[238] 7 ліпеня 1925 г. К. Езавітаў пісаў былому прэм'еру БНР: "*Вашы заслугі ў гісторыі беларускае культуры мы ўсе цэнім. Я асабіста думаю, што Ва маглі бы даць яшчэ больш, каб*

Разыходжанні ў поглядах з В. Ластоўскім не перашкаджалі К. Езавітаву шчыльна супрацоўнічаць з ім у грамадскіх і культурна-асветных ініцыятывах, якія служылі беларускай справе. 2 ліпеня 1925 г. Цэнтральная ўправа таварыства беларусаў-выбаршчыкаў скіравала ліст мясцовым управам у Даўгаўпілсе, Лудзы і Краславе з просьбай абмеркаваць магчымасць запрашэння В. Ластоўскага ў Латвію з мэтай чытання лекцый для латвійскіх беларусаў[239]. Акрамя таго, К. Езавітаў быў адным з самых актыўных чытачоў і аўтараў выдавецкай прадукцыі В. Ластоўскага. На просьбу былога прэм'ера БНР ён падрыхтаваў нарыс успамінаў *Беларуская Цэнтральная Вайсковая Рада*, а таксама зацемкі пра беларускае жыццё ў Латвіі. Кастусь Езавітаў быў таксама адным з галоўных распаўсюднікаў ковенскіх выданняў. Праз Рыгу праходзіў галоўны і, што вельмі істотна, самы танны шлях распаўсюду прэсы і літаратуры. Лідар латвійскіх беларусаў высылаў яе ў розныя асяродкі беларускага жыцця, перадусім – у Вільню і Прагу. З яго дапамогай у беларускія школы Латвіі траплялі асобнікі "Крывіча". К. Езавітаў і сам нярэдка друкаваўся ў гэтым выданні пад псеўданімам[240]. У 1924 г. ён распаўсюджваў сярод беларускага латгальскага настаўніцтва *Слоўнік геамэтрычных і трыганамэтрычных тэрмінаў і сказаў* іншага літоўскага беларуса К. Дуж-Душэўскага[241]. У 1925 г. В. Ластоўскі запрасіў латвійскіх беларусаў да ўдзелу ў працы па арганізацыі беларускага эмігрыйнага цэнтра – замежнага камітэта, які павінен быў займацца актуальнымі беларускімі справамі, у тым ліку новым літоўска-беларускім паразуменнем. Былы прэм'ер БНР

Вас не адрывалі для працы палітычнае. А таму і зусім зразумела, чаму я казаў аб паважным выдавецтве. Пад такім выдавецтвам я разумею выдавецтва, у якім Вам належала бы кіруючая роля, але наўкола каторага маглі бы працаваць усе здольныя да таго людзі, незалежна ад іх палітычных паглядаў ці адносінаў да іх паасобных літоўскіх дзеячоў. Ну, зусім ужо зразумела, у гэтым выдавецтве Вы не павінны займацца карэктурнымі працамі, для гэтага мы маемо ўжо даволі моладзі, намі ўзгадаванай. Не хаціце 'адзінага фронту' і 'сяброўства', зрабіце 'перамір'е' і абвесціце нейтралітэт. Але не павінна быць вайны. Яна для нас – згуба. Не перашкаджайце працы тых, хто можа працаваць у напрамку палітычным. А яны не будуць працаваць Вашае працы культурнае (...) Я рашуча выказваюся за тое, каб нарэшце было спынена гэта ўнутрашняе змаганне, якое ідзе на карысць нашым ворагам і дарэмна марнуе нашыя сілы. Аб гэтым я пішу у Прагу і гр. Цвікевічу". АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1612.

[239] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1597.

[240] Друкуючы свае матэрыялы ў "Крывічы" К. Езавітаў падпісаўся псеўданімам "Кастусь Латгальскі". Аднак рэдакцыя выпадкова апублікавала яго тэкст пра беларусаў у Латвіі пад сапраўдным прозвішчам, што выклікала незадаволенасць аўтара. У лісце К. Езавітава В. Ластоўскаму чытаем: "*Дзякуючы гэтаму мне: па-перш трэба крыху змяніць змест працягу, па-другое – атрымаліся непрыемнасці тутака, а па-трэцяе мае кроўныя атрымалі зноў розныя непрыемнасці ад усходнікаў. Дзеля гэтага – умовімся. Калі я пішу псеўданім, дык або з ім і друкаваць, або зусім не друкаваць*!" БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 56, л. 30.

[241] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1500, 1501.

планаваў склікаць агульнабеларускую канферэнцыю на эміграцыі. Ён лічыў, што латвійскія беларусы мусяць быць сярод актыўных гульцоў на беларускай нацыянальнай сцэне[242]. З В. Ластоўскім ліставаўся малады латгальскі беларус А. Сальцэвіч. Гарачы прыхільнік В. Ластоўскага, ён называў сябе "беларусам-крывічом", жадаў далучыцца да "Сувязі нацыянальна-дзяржаўнага адраджэння Беларусі", дзяліўся з В. Ластоўскім планамі стварыць у Латвіі беларускую чытальню-кнігарню і прасіў даслаць літаратуру[243].

Пераломным момантам у гісторыі літоўскіх беларусаў быў ад'езд В. Ластоўскага ў Менск у 1927 г. Гэта паклала канец беларускай культурна-асветнай актыўнасці ў Коўне. Напярэдадні, 13 красавіка 1927 г. беларускі дзеяч прачытаў для слухачоў Рыжскіх беларускіх настаўніцкіх курсаў лекцыю пра унію ВКЛ і Польшчы[244]. Спроба адрадзіць беларускае жыццё ў Коўне адбылася на пачатку 1932 г., калі намаганнямі С. Якавюка было створана Беларускае культурна-асветнае таварыства (БКАТ). Арганізацыя разгарнула працу ў сталіцы і на правінцыі. БКАТ усталявала сувязі з беларускімі арганізацыямі Латвіі і дамовілася пра культурны абмен. 22 студзеня 1933 г. у Коўне адбылося ўрачыстае адкрыццё Беларускага клуба ("Беларуская хатка"), у якім узяла дэлегацыя латвійскіх беларусаў (Я. Кастылюк – ад Рыжскай беларускай дадатковай школы для дарослых, У. Гусарэвіч – ад БТТЛ, М. Дзямідаў – ад таварыства "Беларуская хата")[245]. У апазіцыі да БКАТ узімку 1933 г. узнавіў працу БЦЛ на чале з К. Дуж-Душэўскім. Аднак арганізацыя была нешматлікай і не мела вялікіх поспехаў. Адносіны паміж С. Якавюком і К. Дуж-Душэўскім былі настолькі антаганістычныя, што двойчы былі прадметам судовага разбіральніцтва (21 лістапада 1927 г. і 3 красавіка 1933 г.). Кіраўнік БЦЛ прайграў справу ў судзе, што стала прычынай маргіналізацыі яго ролі ў беларускім жыцці і адыходу ад грамадскай працы[246].

Сваркі ў асяроддзі літоўскіх беларусаў выклікалі водгук у Рызе. Кіраўнік БЦЛ намагаўся засцерагчы латвійскіх беларусаў ад кантактаў з С. Якавюком як савецкім агентам[247]. У чэрвені 1931 г., падчас настаўніцкай экскурсіі, група беларускіх дзеячаў Латвіі (К. Езавітаў, М. Дзямідаў, С. Сіцько, П. Журкоўскі) наведала Коўна і ўзяла ўдзел у нарадзе з ковенскімі беларусамі (К. Дуж-Душэўскі, Васіль Барысовіч, С. Якавюк, Аляксандр Плескачэўскі). Гэта была

---

[242] LVVA, 3235 f., 2 ap., 3437 l., 17 lp.

[243] LCVA, f. 368, ap. 1, b. 36, l. 7–13.

[244] *З жыцьця беларускіх школ у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1927, № 6(4), с. 86.

[245] Ул. Гусарэвіч, *Адчыненьне Беларускага Народнага Унівэрсытэту ў Літве*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 2(9), с. 287–288.

[246] Гл. больш: T. Błaszczak, *Białorusini w Republice Litewskiej 1918–1940*, Białystok 2017, s. 270–290.

[247] LYA, K-l, ap. 58, b. P-7427, Пратакол допыту С. Якавюка, 26 III 1941 г.

спроба яднання прыхільнікаў С. Якавюка і К. Дуж-Душэўскага[248]. У залагоджванне канфлікту асабліва заангажаваўся К. Езавітаў, які крытычна ацэньваў працу беларускіх дзеячаў у Літве, звяртаючы ўвагу на сваркі і непаразуменні, а таксама на пасіўнасць інтэлігенцыі, што спрыяла дэнацыяналізацыі беларускай меншасці. Латвійскі беларус лічыў, што перыяд "палітычна-эмігрэцыйнай" дзейнасці пад эгідай БНР прайшоў і заклікаў да стварэння беларускай культурна-асветнай арганізацыі, каб актывізаваць мясцовае беларускае насельніцтва ў Літве[249]. Сімпатыі К. Езавітава знаходзіліся на баку прыхільнікаў С. Якавюка. Яго апанента ён вінаваціў у бяздзейнасці і шкоднасці, за праяву чаго лічыў аднаўленне К. Дуж-Душэўскім БРЛ у супрацьвагу БКАТ С. Якавюка. Латвійскі беларус залічваў К. Дуж-Душэўскага і В. Барысовіча да "кабінетных дзеячаў", якіх літоўскае МЗС выкарыстоўвала ў змаганні з палякамі за Вільню[250]. У 1931 г. падчас настаўніцкай канферэнцыі ў Коўне К. Езавітаў сустрэўся з Міколасам Біржышкам і Ёзасам Пурыцкісам, якія запэўнілі, што літоўскія ўлады не будуць перашкаджаць дзейнасці Беларускага культурна-асветнага таварыства[251]. Увесну 1933 г. К. Езавітаў ад імя рэдакцыі "Беларускай Школы ў Латвіі" звярнуўся да выдаўцоў віленскай "Беларускай крыніцы" з просьбай паўплываць на К. Дуж-Душэўскага і "*ён нарэшце спыніў сваю барацьбу з беларускім меншасцёвым рухам у Літве*"[252].

У значнай ступені пазіцыя К. Езавітава была вынікам як асабістага сяброўства з С. Якавюком, так і кантактаў з савецкім бокам ды непрымання "згодніцкай" палітыкі ў дачыненні да літоўцаў[253]. Больш стрыманую пазіцыю

---

[248] К. Езавітаў, *Ці інжанэр-архітэктар К. Душэўскі хоча зрыву працы беларускае меншасьці у Літве?*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 2(9), с. 285–286.

[249] К. Езавітаў, *Да арганізацыі беларускае нацыянальнае меншасьці у межах сучаснае Літоўскае Рэспублікі*, "Голас беларуса" 1926, № 4 ад 1 траўня, с. 2–3.

[250] К. Езавітаў, *Ці інжанэр-архітэктар К. Душэўскі хоча зрыву працы беларускае меншасьці у Літве?*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 2(9), с. 285–286.

[251] ГАРФ, ф. 5875, оп. 1, д. 11, л. 281.

[252] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 43, л. 83–84.

[253] 22 кастрычніка 1933 г. К. Езавітаў пісаў у лісце В. Захарку: "*Я не веру літвіном, бо яны ня ставяцца да нас шчыра, а толькі хочуць беларускімі рукамі здабыць Вільню і Горадню. Я лічу памылковай і палітыку Душэўскага, які нічога не зрабіў, каб умацаваць стан беларускае меншасці ў межах сучаснае Літвы (…) Таму і з літоўскай палітыкай ігнаравання патрэб беларускае меншасці ў межах сучаснае Літвы, і з дуракаватай пазіцыяй нямога Душэўскага трэба, безумоўна, змагацца ўсімі сіламі. Але гэта змаганне павінна ісці па лініі: 1) арганізацыі беларускае меншасцевае масы ў Літве, шляхам уцягвання ў свае нацыянальныя культурна-прасветныя арганізацыі, якія павінны быць адчынены ва ўсіх мясцовасцях, дзе жывуць беларусы; 2) шляхам арганізацыі беларускіх школ, хораў, курсаў і тэатральных груп, якія сваёй працай будуць змагацца за свядомасць і супраць паланізацыі, русіфікацыі і літвінізацыі нашага жыхарства. Працу Якавюка ў гэтым кірунку я цалкам падтрымліваю і маральна (радамі, інструктаваннем і кансультаваннем па розных справах) і нават матэрыяльна (кнігамі, падсылкай*

наконт спрэчкі ў асяроддзі літоўскіх беларусаў займалі іншыя лідары беларускага руху ў Латвіі. 7 чэрвеня 1933 г. адбыўся сход сяброў ТБНЛ з удзелам прадстаўнікоў іншых беларускіх арганізацый і ўстаноў, на які быў запрошаны К. Дуж-Душэўскі. Удзельнікі заклікалі суайчыннікаў у Коўне як мага хутчэй ліквідаваць непаразуменні паміж БЦЛ і БКАТ і стварыць Беларускі нацыянальны камітэт у Літве. Пры гэтым аўтары дакумента ўстрымаліся ад ускладання на каго-колечы віны за канфлікт[254].

На пачатку 1930-х гг. у асяроддзі беларускіх дзеячаў Літвы і Латвіі нарадзілася думка склікаць канферэнцыю беларускіх арганізацый. Ініцыятары першапачаткова планавалі запрасіць да ўдзелу і прадстаўнікоў польскіх беларусаў. 23 сакавіка 1931 г. управа таварыства "Беларуская хата" звярнулася да беларусаў Коўна і Вільні з прапановай зладзіць канферэнцыю, каб абмеркаваць бягучы стан беларускіх спраў і выпрацаваць агульны напрамак далейшай дзейнасці[255]. У жніўні 1931 г. з ініцыятывы М. Дзямідава кіраўніцтва таварыства "Беларуская хата" прыняло ўхвалу аб неабходнасці склікання 3-й Усебеларускай нацыянальнай канферэнцыі[256]. Літоўскія беларусы з БКАТ лічылі, што яна павінна адбыцца ў Коўне. Аднак супраць выступіў К. Езавітаў, аргументуючы, што дзеячы з Заходняй Беларусі туды не трапяць. Ён таксама лічыў, што нельга праводзіць мерапрыемства пад апекай непрыхільнай да беларусаў Літвы[257]. Тым часам, К. Дуж-Душэўскі, які патрабаваў уключэння яго БЦЛ у склад арганізатараў, прапанаваў на месца правядзення Рыгу, куды маглі прыехаць віленскія дэлегаты. Задума склікання канферэнцыі не выклікала энтузіязму старшыні Рады БНР В. Захаркі. У звароце (24 кастрычніка 1933 г.) да беларускіх дзеячаў Латвіі (К. Езавітава, С. Сахарава, М. Дзямідава, У. Пігулеўскага) падзяліўся крытычнымі заўвагамі

штомесячніка і брашур). Аднак, меншасцёвы маштаб не задавольвае і самога Якавюка ды і літвінаў, якія хацелі б лепш, каб ковенскія беларусы дапамаглі ліцвінам у розных дыверсіях на Заходняй Беларусі. У працягу 2-х год я стрымліваў і стрымліваю Якавюка ад якіх бы то ні было авантур у Зах. Беларусі, увесь час націскаючы, каб ён абмежаваўся працай над умацаваньнем стану беларускае меншасці ў Літве. Але вось зара ён носіцца з праектам Усебеларускае Канферэнцыі". ГАРФ, ф. 5875, оп. 1, д. 11, л. 157.

[254] На сходзе прысутнічалі: ад імя кіраўніцтва ТБНЛ – С. Сахараў, К. Езавітаў, Я. Клагіш; ад імя кіраўніцтва таварыства "Беларуская хата" – М. Дзямідаў; ад імя Торэнсбергскага аддзела таварыства "Беларуская хата" – К.Казакевіч; ад імя кіраўніцтва таварыства "Прасвета" – Я. Кастылюк; ад імя кіраўніцтва ТБМЛ – Ф. Клагіш; ад імя БТТЛ – У. Гусарэвіч; ад імя кіраўніцтва БЦАПТ – С. Сіцько; ад імя рэдакцыі часопіса "Беларуская школа ў Латвіі" – Г. Нікіфароўская; ад імя літоўскіх беларусаў – К. Дуж-Душэўскі. ГАРФ, ф. 5875, оп. 1, д. 11, л. 127–127 зв.; LYA, K-l, ap. 58, b. P-7427, Пратакол сходу Цэнтральнага праўлення ТБНЛ пры ўдзеле прадстаўнікоў іншых беларускіх арганізацый, 7 VI 1933 г.

[255] LVVA, 2750 f., 1 apr., 7 l., 42 lp.

[256] LVVA, 2750 f., 1 apr., 6 l., 22 lp.

[257] ГАРФ, ф. 5875, оп. 1, д. 11, л. 444.

наконт задумы ковенскіх беларусаў склікаць "Усебеларускую канферэнцыю"[258]. Праз адсутнасць кампрамісу было вырашана склікаць канферэнцыю беларускіх арганізацый Літвы і Латвіі, мэтай якой будзе актывізацыя культурна-асветнага супрацоўніцтва. Праўда, некаторыя актывісты лічылі неабходным узняць і палітычныя пытанні[259]. На думку Томаша Блашчака мерапрыемства не адбылося па прычыне травеньскага пераварота ў Латвіі[260]. Тым не менш, некаторыя арганізацыі латвійскіх беларусаў паспелі абраць дэлегатаў. Напрыклад, 23 лютага 1934 г. кіраўніцтва таварыства "Беларуская хата" прыняло рашэнне дэлегаваць у склад бюро канферэнцыі Я. Кастылюка і У. Гусарэвіча[261].

Нягледзячы на геаграфічную блізкасць паміж літоўскімі і латвійскімі беларусамі, апошнія былі ў значна лепшай сітуацыі. Умовы, якія панавалі ў Латвіі, ацэньваліся беларускім актывам як больш спрыяльныя развіццю беларускай справы. Невыпадкова, частку мясцовага беларускіх дзеячаў складалі тыя, хто пад уплывам жыццёвых абставін прыехаў з Літвы. Сярод іх быў А. Дварэцкі, які ў лісце У. Пігулеўскаму (2 траўня 1934 г.) пісаў: "*Латвія мая бацькаўшчына, я тутака радзіўся, вырас, быў прыпісан, ажаніўся, зжыўся – але галоўнае яна, адзіная дзяржава, якая не аказалася дзеля беларусаў 'мачахаю', а дала нам магчымасць шырокае культурна-нацыянальнае працы, дала прававое становішча і добры кавалак хлеба. І праца тутака, Вы ведаеце, захапіла мяне і гэта ў той час, калі ўсе свядомыя беларускія дзеячы павінны былі парваць з Літвою, – у якой усе беларускія арганізацыі ліквідаваліся, як вайсковыя, так нават і Міністэрства Беларускіх Спраўаў, таму беларусы змушаны былі пакінуць Літву і шукаць кавалак хлеба ў нас у Латвіі, як гр. Якубецкі, Сіцько і інш., а адказныя сябры беларускага ўрада: Крачэўскі, Захарка, Цвік і інш. зусім парваць з Літвой, 'хлопнуть дверью' і апынуцца ў Празе*"[262].

---

[258] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 142, л. 9–10.

[259] У лісце (10 снежня 1933 г.) С. Якавюку К. Езавітаў наступным чынам бачыў мэту канферэнцыі: "*Даць зразумець гаспадаром Краяў, што беларусы ўжо палітычна граматны народ, разумеюць свае патрэбы і ўмеюць згаварыцца, калі патрэбна, каб разам выступаць і бараніць свае правы перад Урадам. Знача на Канферэнцыі павінны быць прадэманстраваны агульны культурна-асветны, а мо і палітычны фронт беларускае меншасці*". Адначасова ён лічыў, што ніякіх палітычных рэзалюцый канферэнцыя не павінна рабіць (напрыклад, у сувязі з дзяржаўнай прыналежнасцю Вільні ці Гародні), а засяродзіцца на культурна-асветных справах, перадусім школьнай справе і падручніках. Ён не раіў ператвараць канферэнцыю ў нейкі суд над К. Дуж-Душэўскім. Дзеяч сцвярджаў, што, наадварот, не варта надаваць значнай увагі апошняму, каб ён "*зразумеў, што яго 'цэнтр' пазбаўлены досведу і нічога агульнага з 'цэнтрам' В. Ластоўскага, ні літоўскімі беларусамі, ні беларускім рухам не мае*". ГАРФ, ф. 5875, оп. 1, д. 11, л. 169.

[260] T. Błaszczak, *Białorusini w Republice Litewskiej 1918–1940*, Białystok 2017, s. 290.

[261] LVVA, 2750 f., 1 apr., 6 l., 43 lp.

[262] LVVA, 3235 f., 2 apr., 5445 l., 24–25 lpp.

Беларусы Латвіі спарадычна ўдзельнічалі ў літоўска-латвійскім культурным супрацоўніцтве і тым самым спрычыняліся да пашырэння ведаў пра беларусаў сярод літоўскага грамадства. 21–24 чэрвеня 1925 г. у Рызе адбыўся кангрэс настаўнікаў балтыйскіх краін, на якім беларускае настаўніцтва Латвіі прадстаўляў М. Дзямідаў. Ён хутка знайшоў агульную мову з літоўскімі і эстонскімі настаўнікамі. Падчас сустрэчы з'явілася ідэя стварыць Таварыства латвійска-літоўска-беларускага аб'яднання. На кангрэсе прысутнічаў беларускі настаўнік з Эстоніі Валькевіч, які наведаў сядзібы беларускіх арганізацый у латвійскай сталіцы[263]. 2 красавіка 1933 г. па запрашэнні таварыства "Беларуская хата" ў Рызе адбыўся выступ літоўскага прафесара Міколаса Біржышкі (*Mykolas Biržiška*). У мерапрыемстве ўзяло ўдзел шмат прадстаўнікоў беларускай, літоўскай і латвійскай грамадскасці, прэса і прадстаўнікі дыпламатычных колаў. Выступ меў выразна антыпольскі характар, навуковец вінаваціў Варшаву ў акупацыі літоўскіх, беларускіх і ўкраінскіх зямель[264]. Тым часам, С. Сахараў неаднаразова выступаў на ковенскім радыё на тэмы беларускай мінуўшчыны. 17 лютага 1934 г. ён прачытаў рэферат *Літоўска-беларуская дзяржава ў XIII–XVI стагоддзях*, а 18 лютага – *Места Вільня ў XVI стагоддзі і яго роля ў беларуска-літоўскім адраджэнні*[265]. Некалькі латвійскіх беларусаў атрымалі вышэйшую адукацыю ў Коўне. Адным з іх быў выхаванец Даўгаўпілскай беларускай гімназіі Афінаген Зэйгліш, які паступіў у Літоўскі ўніверсітэт у Коўне[266]. Юнак з Латгаліі далучыўся да грамадскага жыцця мясцовых беларусаў[267].

Польшча. Натуральнай з'явай былі грамадска-палітычныя і культурныя кантакты беларускіх дзеячаў Латвіі з заходнебеларускай інтэлігенцыяй. Рыжскія і латагальскія беларусы ўспрымалі Заходнюю Беларусь як частку беларускай зямлі, што знаходзіцца пад акупацыяй чужынцаў. Вільня ж разглядалася як "калыска беларускага адраджэнскага руху". На чале беларускіх арганізацый і ўстаноў у польскай дзяржаве знаходзіліся даўнія сябры і паплечнікі беларускіх дзеячаў Латвіі. Польскіх і латвійскіх беларускіх актывістаў яднала не толькі супольнае мінулае, але і сучаснасць: у абедзвюх краінах беларусы апынуліся ў сітуацыі нацыянальнай меншасці. Аднак становішча беларусаў у Польшчы і ў Латвіі карэнным чынам адрознівалася дзеля рознага стаўлення да іх з боку дзяржаўных інстытуцый. Нават павярхоўны

---

[263] М. Дзямідаў, *Яшчэ аб конферэнцыі вучыцялёў балтыйскіх дзяржаў*, "Голас беларуса" 1925, № 7 ад 31 ліпеня, с. 2–3.

[264] *Хроніка беларускага жыцьця ў Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 4(20), с. 288.

[265] *Крывіцкія руны. Вып. III: Беларускі культурны мацярык у Латвіі*, рэд. М. Казлоўскі, С. Панізнік, Менск 2017, с. 254.

[266] *У Радзе Беларускага Аддзелу пры Міністэрстве Асьветы*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 5(22), с. 329.

[267] LYA, K-l, ap. 58, b. P-7427, Пратакол допыту кс. А. Станкевіча, 29 IX 1949 г.

аналіз сітуацыі беларускага насельніцтва абапал латвійска-польскай мяжы дазваляе сцвярджаць, што ў Латвійскай Рэспубліцы жменька беларусаў карысталася непараўнальна лепшымі ўмовамі для існавання нацыянальна-культурнай аўтаноміі, чым у Польшчы.

Не дзіва, што становішча латвійскіх беларусаў выклікала зайздрасць у заходнебеларускіх суайчыннікаў. Яскравым прыкладам можа быць параўнанне колькасці беларускіх пачатковых школ у Латвіі і Заходняй Беларусі. Нагадаем, на пачатку 1920-х гг. адносна нешматлікая беларуская меншасць Латвіі мела больш як 50 пачатковых школ. Такімі вынікамі не маглі пахваліцца дзеячы ў Заходняй Беларусі, дзе жылі амаль 2 мільёны беларусаў, але нацыянальныя школы існавалі ў сімвалічным выглядзе[268].

Культурна-асветныя цэнтры ў Рызе і Даўгаўпілсе – з аднаго боку і ў Вільні – з другога шчыльна кантактавалі. На пачатку існавання беларускага нацыянальнага руху ў Латвіі мясцовая інтэлігенцыя мусіла карыстацца дапамогай віленчукоў, якія мелі досвед культурна-асветнай працы. Менавіта з Вільні ў 1920-я гг. латвійскія беларусы замаўлялі падручнікі і іншую літаратуру на роднай мове на патрэбы школ. Акрамя таго, з Заходняй Беларусі паходзілі многія дзеячы, якія далучыліся да культурна-асветнай працы ў Латвіі. Сярод іх належыць пералічыць І. Краскоўскага, А. Якубецкага, Э. Будзьку, М. Дзямідава і інш. Рыжскаму і даўгаўпілскаму асяродкам беларускай інтэлігенцыі даводзілася супрацоўнічаць у розных справах з віленскімі Таварыствам беларускай школы (у справе арганізацыі выезду моладзі ў ВНУ Чэхаславакіі), Беларускім выдавецтвам (у справе атрымання літаратуры), Беларускім навуковым таварыствам, Беларускім музеем імя Івана Луцкевіча.

Кантакты паміж латвійскімі і заходнебеларускімі дзеячамі ў значнай ступені мелі культурна-асветны характар. Латвійскія беларусы рэагавалі на становішча беларускай асветы ў Польшчы намагаючыся дапамагаць у цяжкіх сітуацыях. Напрыклад, на пачатку 1924 г. К. Езавітаў ініцыяваў сярод беларускай грамадскасці ў Латгаліі збор сродкаў на патрэбы настаўнікаў Нясвіжскай беларускай гімназіі, якую зачынілі польскія ўлады. Было сабрана 2 300 рублёў, з якіх 500 унёс К. Езавітаў[269].

Геаграфічная блізкасць Латгаліі і Віленшчыны дазваляла будаваць планы ўзаемных візітаў прадстаўнікоў інтэлігенцыі. У 1929 г. з ініцыятывы Даўгаўпілскага аддзела ТБНЛ адбылася экскурсія беларускага настаўніцтва

---

[268] Гл. больш: M. Siemakowicz, *Organizacja szkolnictwa dla ludności białoruskiej w II Rzeczypospolitej*, "Białoruskie Zeszyty Historyczne" 1999, z. 19, s. 80–132; M. Siemakowicz, *Polityka oświatowa władz polskich wobec mniejszości białoruskiej w Drugiej Rzeczypospolitej – aspekt programowy* [w:] *Białoruś w XX wieku. W kręgu kultury i polityki*, red. D. Michaluk, Toruń 2007, s. 625–642.

[269] А. Вабішчэвіч, *"Але ж шлях да свабоды старонка праложа!"* [у:] *Сыны і пасынкі Беларусі*, рэд. С. Барыс, Менск 1996, с. 329.

(23 чал.) у Вільню[270]. Праўда, ажыццяўляць планы нярэдка перашкаджала бюракратыя. У сярэдзіне траўня 1929 г. група даўгаўпілскіх беларусаў (каля 30 чал.) планавала чарговую экскурсію ў Вільню. З прычыны адсутнасці візаў задума не была рэалізаваная[271]. З ліставання К. Езавітава з літоўскім беларусам С. Якавюком вынікае, што ў жніўні 1930 г. першы планаваў паездку ў Вільню, але баяўся "ці пусцяць і ці выпусцяць назад"[272]. У чэрвені 1931 г. група віленскіх беларусаў на чале з Антонам Луцкевічам планавала экскурсію ў Латвію. Віленчукі збіраліся наведаць Рыгу, Даўгаўпілс, Прыдрую і іншыя мясцовасці. Аднак віленчукам не ўдалося атрымаць замежных пашпартоў[273].

Актыўныя кантакты з лідарамі латвійскіх беларусаў падтрымліваў Антон Луцкевіч[274]. Яго дачыненні з К. Езавітавым мелі навукова-асветны характар. Лідар латвійскіх беларусаў раіўся з былым прэм'ерам БНР у справах, звязаных з пачынаннем навукова-краязнаўчай працы, бо А. Луцкевіч меў досвед кіравання Беларускім навуковым таварыствам. Акрамя таго, К. Езавітаў прасіў віленскага беларуса даслаць недаступную ў Латвіі дарэвалюцыйную літаратуру па беларускай культуры. У 1932 г. А. Луцкевіч прапанаваў К. Езавітаву арганізаваць у Рызе выставу беларускіх мастакоў. Тым часам К. Езавітаў меў намер з дапамогай А. Луцкевіча выдаць альбом беларускай народнай вопраткі, бо лічыў, што "*для нашага адраджэнчага руху такі альбом зрабіў бы не менш, чым зборнік спеваў беларускіх, бо ён даў бы і дзяўчатам, ды і хлапцом ванковае афармленне ў вопратцы, якога зара так шукаюць многія*"[275].

Істотнай падзеяй у жыцці латвійскіх беларусаў быў візіт А. Луцкевіча. 10 красавіка 1932 г. падчас сходу рыжскага беларускага настаўніцтва У. Пігулеўскі паведаміў, што дзеяч жадае завітаць у Латвію з лекцыямі. Праблемай, аднак, з'яўлялася адсутнасць у бюджэце БША грошай на арганізацыю паездкі. У адказ К. Езавітаў заявіў, што "прыезд старых беларускіх дзеячаў вельмі пажаданы, а сродкі дзеля гэтага можна адшукаць". Ён выказаў думку, што варта спалучыць лекцыі з тэатральнымі выступамі, напрыклад, з паказам п'есы

---

[270] *Экскурсія беларускай гімназіі і вучыцельства ў Вільню*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1929, № 9(1), с. 4.

[271] *З беларускага жыцьця у Латвіі*, "Голас беларуса" 1929, № 2 ад 22 ліпеня, с. 4; LVVA, 2067 f., 1 ap., 364 l., 488 lp.

[272] Становішча беларускай працы ў Польшчы і Латвіі ён ацэньваў як не найлепшае: "*Тутака мы варушымся, але насядаюць расейцы і палякі, дык і латышы пачынаюць браць прыклад 'урадавання' ад Польшчы (...) каб падняць працу і ў вас, і ў нас, трэба актывізацыя і адначасныя добра прадуманыя крокі і метады працы*". НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 20, л. 2.

[273] *Хроніка*, "Думка беларуса" 1931, № 1, с. 3; *Карэспандэнцыі*, "Думка беларуса" 1931, № 2, с. 2.

[274] 31 сакавіка 1934 г. А. Луцкевіч у лісце дзяліўся з У. Пігулеўскім навінамі наконт "злодзея" Астроўскага і беларускіх спраў у Польшчы і ў свеце. LVVA, 3235 f., 2 apr., 5445 l., 26 lp.

[275] LMAB, F 21/279. L. 16–19.

Змагары за ідэю. Удзельнікі сходу вырашылі стварыць камітэт (К. Езавітаў, М. Дзямідаў і кіраўнікі школ) па падрыхтоўцы прыезду А. Луцкевіча[276]. У красавіку 1932 г. па запрашэнні ТБНЛ А. Луцкевіч наведаў Латвію. Захаваліся падрабязныя звесткі пра яго знаходжанне ў краіне. 23 красавіка 1932 г. у 1-й школе ён прачытаў лекцыю *Пяснярка – барацьбітка*, прысвечаную Цётцы. На наступны дзень у школе для дарослых і 26 красавіка ў Даўгаўпілсе А. Луцкевіч выступіў на тэму *Янка Купала – прарок беларускага адраджэньня*. Пасля лекцыі спяваў хор, вучні прачыталі вершы Я. Коласа і Я. Купалы[277]. Віленскі дзеяч быў пад уражаннем ад дасягненняў латвійскіх беларусаў. У газеце "Беларускі звон" ён адзначаў: "*Мушу перадусім адзначыць, што я з вялікай пашанай глядзеў на гэту працу. Латвійскія беларусы дужа добра зразумелі, што беларускае пытанне, як пытанне палітычнае, не можа быць вырашана ў межах Латвіі, дзе лічба нашых братоў сягае толькі нейкае сотні тысяч. І яны свае сілы пакіравалі перадусім на культурна-прасветную працу, узгадоўваючы кадры будучых актыўных нацыянальных працаўнікоў, якія павінны папоўніць вельмі нячысленыя рады беларускае інтэлігенцыі ў Латвіі і далучыцца да творчае працы ўсяго нашага народа. І хаця сярод гэтае інтэлігенцыі сустракаюцца прадстаўнікі розных палітычных і сацыяльных кірункаў, аднак на фронце культурным існуе поўная еднасць і салідарнасць, якая і дае магчымасць латвійскім беларусам рабіць незвычайна цэнную і патрэбную нацыянальную работу. Безумоўна, дзеля тых дасягненняў, якія я бачыў у Латвіі, аднаго жадання групы актыўных беларусаў было б мала. Патрэбны былі адпаведныя аб'ектыўныя варункі. І гэтыя варункі стварыла для сваіх 'меншасцяў' дэмакратычная Латвійская Рэспубліка (...) з праўдзівай завісцю прыходзіцца ўглядацца нам, 'заходнікам', на тое, што мае маленечкая жменя беларусаў (...) у Латвіі*"[278]. На публікацыю звярнула ўвагу польскае МУС, якое ўбачыла ў словах А. Луцкевіча праяву крытыкі польскай нацыянальнай палітыкі[279].

Кантакты з латвійскімі беларусамі падтрымлівала кіраўніцтва Беларускага студэнцкага саюза (БСС), якое запрасіла пабрацімаў з Латвіі на ўрачыстае святкаванне 10-годдзя арганізацыі, якое адбылося 23 лістапада 1930 г. у Вільні[280]. У ліку запрошаных апынулася прадстаўніца БТТЛ Л. Тэтар[281].

---

[276] LVVA, 2125 f., 5 ap., 12 l., 16 lp.

[277] LVVA, 2125 f., 5 apr., 92 l., 24 lp.; *Беларусы ў Латвіі*, "Беларускі звон" 1932, № 14 ад 13 траўня, с. 3; *Хроніка беларускага жыцьця ў Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, 1(11), с. 160; *Хроніка беларускага жыцьця у Латвіі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 2(12), с. 176.

[278] А. Луцкевіч, *Беларускія культурныя арганізацыі і ўстановы ў Латвіі*, "Беларускі звон" 1932, № 14 ад 13 траўня, с. 2, № 15 ад 27 траўня, с. 2–3, № 16 ад 4 чэрвеня, с. 2–3.

[279] AAN, sygn.: MSW, t. IV/89, s. 38–39, Sprawozdanie z życia mniejszości narodowych za II kwartał 1932 r.

[280] LVVA, 1826 f., 1 ap., 1004 l., 55 lp.

[281] LVVA, 1747 f., 1 apr., 25 l., 63 lp.

Да культурна-асветных кантактаў можна залічыць навучанне латвійскіх беларусаў у Вільні. Гісторыя ведае некалькі выпадкаў, калі беларускія юнакі з Латвіі вучыліся ва Універсітэце Стэфана Баторыя (УСБ). Праўда, латвійскія беларусы траплялі ў віленскае ВНУ самастойна, а не па накіраванні беларускіх арганізацый. У віленскім alma mater вучыліся выхаванцы Даўгаўпілскай беларускай гімназіі Яўген Бартуль, Язэп Клагіш і Пятро Журкоўскі. Першы скончыў факультэт права і грамадскіх навук УСБ, атрымаў польскае грамадзянства і працаваў следчым. Тым часам, П. Журкоўскі ў 1926 г. стаў студэнтам фізіка-прыродазнаўчага факультэта УСБ, але з матэрыяльных прычын не скончыў яго. Няма звестак, каб падчас навучання ў Вільні яны ўдзельнічалі ў тамтэйшым беларускім руху[282].

У міжваенны час існавалі кантакты паміж беларускімі перыёдыкамі Латвіі і Заходняй Беларусі. На старонках заходнебеларускіх газет раз-пораз з'яўлялася інфармацыя пра жыццё латвійскіх беларусаў. Некаторыя выданні мелі нясталую рубрыку "Беларусы ў Латвіі". Заходнебеларуская прэса намагалася асвятляць культурна-асветнае жыццё латвійскіх беларусаў, а таксама рэагаваць на іх праблемы. 29 студзеня 1932 г. польскія беларусы на старонках газеты "Беларускі звон" пратэставалі супраць завастрэння курсу нацыянальнай палітыку латвійскіх улад. Аўтары падкрэслівалі, што абмежаванні ў дачыненні да нелатышоў найбольш зашкодзілі латвійскім беларусам, за якіх ніхто не заступіцца: "*Там, у Латвіі, няма каму пратэставаць проці ўціску беларусаў дарваўшыміся да ўлады латышскімі нацыяналістамі. Няма каму падняць гэтае справы і перад Лігай Нацыяў, што, пэўне ж, будзе зроблена і палякамі, і расейцамі, і немцамі. Дык няхай жа пачуецца хоць гэты наш цвёрды голас пратэсту – голас тэй часці грамадзянства беларускага, якая, верная высокім агульналюдскім ідэалам, заўсёды востра асуджала ўсялякі гвалт 'пануючых нацыяў' над падлеглымі ім 'меншасцямі', незалежна ад таго, ці датычыла гэта нас, беларусаў, ці каго іншага, хоць бы нашага ідэйнага ворага*"[283].

Асаблівую ролю ў падтрыманні сувязяў з заходнебеларускімі выданнямі адыграў К. Езавітаў. Ён ліставаўся з рэдактарам "Шляху моладзі" Язэпам Найдзюком і Антонам Луцкевічам, з якімі абменьваўся выданнямі і абмяркоўваў падзеі агульнабеларускага і заходнебеларускага жыцця[284]. Ён рупіўся,

---

[282] *Уціск беларускае школы*, "Думка беларуса" 1931, № 3, с. 2; *У Радзе Беларускага Аддзелу пры Міністэрстве Асьветы,* "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 5(22), с. 329.

[283] *Пратэстуем!* "Беларускі звон" 1932, № 4 ад 29 студзеня, с. 1; AAN, sygn.: MSW, t. IV/89, k. 38–39, Sprawozdanie z życia mniejszości narodowych za II kwartał 1932 r.

[284] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 34, л. 10. У ліставанні з Я. Найдзюком К. Езавітаў падзяліўся думкай, што беларускае кнігадрукаванне можа адрадзіцца ў Літве, Польшчы і БССР, але трэба толькі зрабіць новы "бум". Таму ён заахвочваў віленскага беларуса, каб ён на старонках "Калосся" друкаваў рэцэнзіі старых беларускіх выданняў (НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 94, л. 14).

каб прэса латвійскіх беларусаў пашыраліся ў Заходняй Беларусі. З яго лістоў віленскім беларусам (Адольфу Клімовічу і інш.) вынікае, што аўтар спрабаваў наладзіць сярод заходнебеларускіх чытачоў падпіску на "Беларускую школу ў Латвіі"[285]. 19 ліпеня 1932 г. рэдакцыя гэтага часопіса прасіла рэдакцыю віленскай "Беларускай крыніцы" надрукаваць зацемку пра латвійскі перыёдык і прапанавала абмен выданнямі[286].

Супрацоўніцтва, аднак, ускладнялі разыходжанні сацыяліста К. Езавітава і хадэцкай газеты, пра што сведчыць шэраг інцыдэнтаў з яго ўдзелам на старонках перыёдыка. 4 снежня 1932 г. латвійскі беларус адрэагаваў на публікацыю "Беларускай крыніцы", аўтар якой вінаваціў К. Езавітава ў камунізме. У адказ ён адзначыў, што: "*Нас тутака гэтым тэрмінам у той час іменавалі ўсе прымазаўшыяся да беларускай справы кар'ерысты, якіх мы выводзілі на чыстую ваду*"[287]. Газета нейтральна выказалася пра інцыдэнт, канстатуючы, што арыштаванага за сувязь з камуністамі беларускага дзеяча латвійскія ўлады плануюць выдаліць з краіны[288]. Тым часам абурэнне некаторых заходнебеларускіх дзеячаў і латвійскіх беларусаў выклікала публікацыя К. Езавітава на старонках "Беларускай школы ў Латвіі" (за 1933 г.) прысвечаная абвяшчэнню БНР у 1918 г. Аўтар не згадаў, што Акт 25 сакавіка быў прыняты на прапанову дэлегацыі віленскіх беларусаў на чале з А. Луцкевічам. Ідэю абвяшчэння незалежнасці Беларусі ён прыпісаў Я. Варонку, напісаўшы, што з ініцыятывы групы Луцкевіча была толькі высланая тэлеграма да кайзера Вільгельма II[289].

Некаторыя віленскія беларусы лічылі, што беларуская меншасць у Латвіі пасіўная і не выкарыстоўвае свайго патэнцыялу. У адным з артыкулаў на старонках "Беларускай крыніцы" чытаем: "*А што ж робяць нашы беларусы ў Латвіі? Каб ужо быць справядлівым, трэба адказаць, што зусім мала, або нават і нічога. Трэба адзначыць той сумны факт, што ў невялікай горсткі беларускай інтэлігенцыі няма стычнасці з народам, няма ніякай дзейнай беларускай арганізацыі, каторая б узяла на сябе труд ісці ў масы, усведамляць іх і прыгатаўляць да дзяржаўнага жыцця. Адзіны пасол беларускі грам. Пігулеўскі не можа ўсюды паспець, дый і ён, як сябра латвій-*

---

[285] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 51, л. 40.

[286] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 43, л. 81.

[287] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 43, л. 82.

[288] *Biełarusy ŭ Łatwii*, "Беларуская крыніца", № 25 ад 13 жніўня 1930 г., с. 3.

[289] На старонках віленскага "Роднага краю" з'явілася крытычная зацемка, аўтар якой тлумачыў паводзіны К. Езавітава жаданнем "абяліць перад Саветамі свайго былога таварыша Варонку" і сцвярджаў, што "*сфальшаванне гістарычнага факту і перакіданне адказнасці за недарэчны палітычна крок гр. Варонкі на Луцкевіча можа мець толькі адзін практычны вынік: дасць Саветам падставу 'таўчы' не толькі Луцкевіча, але і ўсіх арыштаваных у Менску беларусаў, якіх тамака крывадушна абвяшчаюць ідэйна звязанымі з Луцкевічам*". *У Латвіі*, "Родны край" № 4 ад 23 лютага 1934 г., с. 6.

скай сац.-дэмакратычнай партыі, не можа выступіць ад імя беларускіх арганізацыяў, а выступае ад латвійскай палітычнай партыі, прамаўляючы па-беларуску да беларусаў. Другія ж беларускія дзеячы нават гэтага не робяць і 'кратаюцца на месцах' здабытых з ласкі латвійскага ўрада"[290]. Тым часам іншы аўтар гэтага ж выдання адзначаў: "*Работы шмат, усведамленне народных мас яшчэ вельмі слабае, дзейнасць інтэлігенцыі беларускай дагэтуль была невялікая і разбітая. Жніво сапраўды вялікае, але работнікаў мала. Што тычыцца ўсведамлення беларускіх нацыянальных масаў у Латвіі, дык яно ёсць не настолькі моцнае, каб магло спірацца і голасна заяўляць аб сваёй народнай прыналежнасці. І не толькі заяўляць, але і дахадзіць свайго права быць запісаным такім, якім ёсць у сапраўднасці, а не такім, якім хочацца перапісчыку*"[291].

У сваю чаргу, дзеячы латвійскіх беларусаў таксама сачылі за падзеямі ў Заходняй Беларусі. У прыватнасці, над Даўгавай рэхам адбілася "грамадоўская рэвалюцыя". Частка беларускай грамадскасці Латвіі, якая гуртавалася вакол К. Езавітава, не хавала сімпатый да Беларускай сялянска-работніцкай грамады (БСРГ). На старонках газеты "Голас беларуса" і часопіса "Беларуская школа ў Латвіі" выказвалі салідарнасць з дзеячамі БСРГ. На старонках першай судовы працэс над Грамадой называўся "новым бандыцкім нападам польскіх паноў на беларускіх сялян і работнікаў". Прадстаўнікі даўгаўпілскіх беларускіх арганізацый 21 снежня 1926 г. выслалі прывітанне беларускім паслам БСРГ Паўлу Валошыну і Пятру Мятле ў знак падтрымкі іх змагання "за вызваленне беларускіх сялян і работнікаў з-пад польскае рэакцыі"[292]. Адзін з нумароў "Беларускай школы ў Латвіі" выказваў спачуванне Браніславу Тарашкевічу ў сувязі з яго арыштам польскімі ўладамі[293]. З ініцыятывы К. Езавітава 26 студзеня 1933 г. удзельнікі 3-га агульнага сходу сяброў ТБНЛ прынялі рэзалюцыю, патрабуючы вызвалення Б. Тарашкевіча, і пратэставалі супраць "*праводзімага польскімі акупацыйнымі ўладамі ў Заходняй Беларусі ўціску беларускага жыхарства і супраць беспадстаўных і жорсткіх рэпрэсій над нацыянальна-адраджэнчымі павадырамі беларускага народа*"[294].

Беларуская прэса ў Латвіі намагалася рэагаваць на крызіс у заходнебеларускім лагеры, які назіраўся пасля ліквідацыі БСРГ. Напрыклад, К. Езавітаў лічыў, што заходнебеларускія лідары павінны кіравацца нацыянальным

---

[290] *Biełarusy ŭ Łatwii*, "Biełaruskaja krynica", № 2 ad 12 studzenia 1930 h., s. 1.

[291] М., *Z życćia biełarusy ŭ Łatwii*, "Беларуская крыніца", № 4 ад 26 студзеня 1930 г., с. 1.

[292] *Беларускае жыцьцё у Латвіі*, "Голас беларуса" 1927, № 1 ад 12 студзеня, с. 4.

[293] Езавітаў, *Акадэміку Браніславу Тарашкевічу, беларускаму вучонаму і змагальніку-адраджэнцу, выказваемо нашае сяброўскае спачуваньне*, "Беларуская школа ў Латвіі"1933, № 1(18), с. 258–259.

[294] *Рэзалюцыя ў справе судовага прысуду над Б. Тарашкевічам*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 1(18), с. 261.

інтарэсам, а не асабістымі амбіцыямі, заклікаў іх яднацца. Дзеяч бачыў магчымасць аб'яднання на грунце нацыянальных інтарэсаў шырокага спектру заходнебеларускай палітычнай сцэны – ад хадэкаў да левых, а таксама лаяльных да польскіх улад на чале з А. Луцкевічам і Р. Астроўскім[295]. Да аб'яднання латвійскі беларус заклікаў нават нацыянал-сацыяліста Уладзіслава Казлоўскага. Кастусь Езавітаў меркаваў, што віленскі БНК павінен быць зачаткам нацыянальнага парламента[296]. Трэба, аднак, адзначыць, што заходнебеларускія справы цікавілі нешматлікую групу латвійскіх беларускіх дзеячаў.

Такім чынам, можна канстатаваць, што беларускі нацыянальны рух у Латвіі не існаваў у ізаляцыі. Яго кіраўнікі разумелі патрэбу ўтрымання мясцовага беларускага нацыянальна-культурнага жыцця ў рэчышчы агульнабеларускага развіцця. Яны мелі шырокія кантакты з суайчыннікамі за межамі краіны. Характар і змест тых кантактаў абумоўлівалі як бягучыя арганізацыйныя і культурна-асветныя патрэбы беларускай меншасці, так і асабістыя погляды прадстаўнікоў беларускага руху ў Латвіі. Большасць кантактаў была магчымая дзякуючы асабістым знаёмствам. Асабліва варта падкрэсліць ролю К. Езавітава, які меў шматлікія сувязі з беларускім актывам у іншых краінах.

Палітычная дзейнасць

Дэмакратычнае заканадаўства латвійскай дзяржавы давала нацыянальным меншасцям (у тым ліку беларусам) шырокую магчымасць весці не толькі культурна-асветную, але і палітычную дзейнасць. Галоўнай праявай палітычнай актыўнасці быў удзел у выбарах у парламент і органы мясцовага самакіравання з магчымасцю правесці туды кандыдатаў. Перш чым перайсці да разгляду ўдзелу беларускай меншасці ў выбарах належыць прааналізаваць латвійскую выбарчую сістэму і расклад палітычных сілаў. Нормы, на падставе якіх адбываліся парламенцкія выбары ў міжваенны час, рэгуляваў Закон аб выбарах. Гэты дакумент быў прыняты 9 чэрвеня 1922 г. У адпаведнасці з ім, аднапалатны Сойм (*Saeima, Саэйма*) абіраўся ўсімі дарослымі (пачынаючы з 21 гадоў) грамадзянамі Латвійскай Рэспублікі на 3-гадовы

---

[295] У лісце да рэдактара "Шляху моладзі" Я. Найдзюку К. Езавітаў пісаў: "*Віленчукі зара павінны парупіцца аб тым, каб каля Нацыянальнага Камітэта былі аб'яднаны ўсе кірункі беларускае грамадскае думкі ў Заходняй Беларусі, каб ён быў агульнабеларускім народным рэпрэзентантам, а не толькі аб'яднаннем пэўнае групоўкі. Трэба перагаворы, каб у Нацыянальны Камітэт увайшлі і 'луцкевічоўцы' з Навуковым Таварыствам, і 'астроўцы' з сваімі арганізацыямі, і ТБШ, і ТБА ды іншыя групы*". Цыт. пав. А. Вабішчэвіч, "*Але ж шлях да свабоды старонка праложа!*" [у:] *Сыны і пасынкі Беларусі*, рэд. С. Барыс, Менск 1996, с. 339.

[296] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 15, л. 4.

тэрмін шляхам прамога, таемнага і прапарцыйнага галасавання. Краіна падзялялася на пяць выбарчых акруг: Рыга, Відзэмэ, Курляндыя, Земгалія і Латгалія. Акругі складаліся з участкаў, якія знаходзіліся ў кожнай мясцовасці, дзе існавала самакіраванне. Буйныя гарады дзяліліся на падучасткі, а Рыга – на ўчасткі. Кандыдатам мог быць кожны, не абавязкова было нават жыць на тэрыторыі той акругі, у якой збіраўся вылучацца. Каб зарэгістравацца кандыдатам належала сабраць і падаць у выбарчую камісію не менш як 100 подпісаў выбаршчыкаў. Падчас галасавання выбаршчык атрымліваў канверт, у які ўкладаў адзін партыйны спіс, які падтрымліваў. Пры гэтым ён мог пакінуць яго ў нязменным стане ці выкрасліць кандыдатаў, якіх не жадаў, альбо мог дапісаць кандыдата з іншага спісу, які балатаваўся па той самай акрузе[297].

У 1920-я г. палітычнае жыццё ў Латвійскай Рэспубліцы было актыўным. Перадвыбарчыя кампаніі адбываліся ва ўмовах палітычнай свабоды. Адметнасцю латвійскай выбарчай сістэмы ў міжваенны час была адсутнасць працэнтнага бар'ера ў дачыненні да партый, якія ўдзельнічалі ў выбарах. Гэта давала магчымасць трапіць у парламент нават нешматлікім і нядаўна створаным палітычным рухам. Заганай такога ліберальнага падыходу была наяўнасць у Сойме шматлікіх партыйных фракцый. Яскрава сведчыць пра гэта колькасць выбарчых спісаў. У 1922 г. кандыдаты ішлі на выбары па 88 спісах, у 1925 г. – па 141, у 1928 г. – па 120. На палітычнай сцэне краіны пераважалі шматлікія дробныя партыі – новыя і недасведчаныя. Нярэдка дэпутаты пакідалі ўласныя партыі і пераходзілі ў іншыя або засноўвалі новыя. З кожнымі чарговымі выбарамі колькасць партыйных спісаў разрасталася. Расла і колькасць партый, якія былі ў стане правесці ў парламент толькі аднаго альбо двух дэпутатаў. Такая сітуацыя ўскладняла стварэнне ўрада альбо перадвызначала яго кароткае існаванне, бо партыйныя кааліцыі былі кволыя і хутка распадаліся. У перыяд ад 1918 да 1934 г. у Латвіі змянілася 18 урадаў, а сярэдні тэрмін існавання кожнага складаў не больш за 16 месяцаў. У 1918–1934 гг. у Латвіі было зарэгістравана 109 палітычных партый і арганізацый самага шырокага ідэалагічнага спектру – ад левых да правых. У 1928 г. у краіне афіцыйна існавала 28 палітычных партый і арганізацый, большасць якіх была прадстаўлена ў парламенце 2–3 дэпутатамі[298].

Уплывовых і буйных партый на міжваеннай палітычнай сцэне было няшмат. На левым фланзе знаходзілася Латвійская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя (ЛСДРП – *Latvijas sociāldemokrātisko strādnieku partija*). Сярод

---

[297] P. Łossowski, *Kraje bałtyckie na drodze od demokracji parlamentarnej do dyktatury: 1918–1934*, Wrocław 1972, s. 53.

[298] P. Łossowski, *Kraje bałtyckie na drodze od demokracji parlamentarnej do dyktatury: 1918–1934*, Wrocław 1972, s. 73–74, 202.

правых сілаў найбольшай папулярнасцю карыстаўся Латвійскі сялянскі саюз (ЛСС – *Latviešu zemnieku savienība*). Абедзве партыі мелі досвед палітычнай барацьбы, а ў іх шэрагах былі тыя, каго належыць лічыць бацькамі латвійскай дзяржаўнасці. Напрыклад, ЛСС ачольваў Карліс Ульманіс. Абедзве партыі цвёрда стаялі на грунце незалежнай Латвіі, але адрозніваліся стаўленнем да ключавых пытанняў сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця краіны. Латвійскі сялянскі саюз надаваў прыярытэтнае значэнне развіццю сельскай гаспадаркі. Тым часам, ЛСДРП бачыла патрэбу інвеставаць у гарадскую прамысловасць. Партыі вялі жорсткае змаганне. Нярэдка партыйны інтарэс браў верх над дзяржаўным. У парламенце ЛСДРП і ЛСС пераваблівалі на свой бок прадстаўнікоў дробных фракцый і асобных дэпутатаў[299].

Шматнацыянальны характар латвійскага грамадства адбіўся ў палітыцы, бо нелатышы ўдзельнічалі ў выбарах і намагаліся правесці сваіх дзеячаў у кіроўныя органы дзяржавы. Нацыянальныя меншасці траплялі не толькі ў парламент, але і ва ўрад. Так, напрыканцы 1920-х гг. немцы атрымалі месца ў Радзе міністраў (Міністэрства юстыцыі), а рускія і палякі мелі тэхнічныя пасады ў іншых ведамствах (МУС, Міністэрства эканомікі). Нацмены засядалі таксама ў радах банкаў (паляк Ян Вільпшэўскі быў сябрам рады Сельскагаспадарчага банка). Згодна з заканадаўствам, у Сойме можна было прамаўляць па-латышску, па-нямецку і па-руску[300].

Беларускія дзеячы разумелі патрэбу мець прадстаўніка ў парламенце, які абараняў бы правы меншасці на найвышэйшым узроўні. Ва Устаноўчым сходзе Латвійскай Рэспублікі (1920–1922 гг.) беларусы не мелі прадстаўнікоў, бо іх нацыянальна-культурная аўтаномія тады толькі фарміравалася. Праўда, па просьбе кіраўніцтва таварыства "Бацькаўшчына" інтарэсы беларускай меншасці восенню 1921 г. згадзіўся прадстаўляць Яніс Райніс. 10–12 жніўня 1922 г. удзельнікі беларускага настаўніцкага з'езда ў Рызе дзякавалі латвійскаму палітыку за падтрымку беларускіх спраў[301]. Але гэта не магло цалкам кампенсаваць беларусам адсутнасці ўласнага дэпутата ў вышэйшым заканадаўчым органе краіны. Восенню 1922 г. беларускія дзеячы ўпершыню атрымалі шанец пазмагацца за месца ў парламенце. На 7 і 8 кастрычніка 1922 г. былі прызначаны выбары ў Сойм I склікання (1922/1925). Галоўнай задачай мясцовага беларускага актыву быў пошук сродкаў на перадвыбарчую барацьбу. Яшчэ 9 жніўня 1921 г. К. Езавітаў інфармаваў В. Ластоўскага пра намер узяць удзел у выбарчай кампаніі і прасіў фінансавай падтрымкі. У лісце прэм'еру БНР чытаем: "*Пачынаем рыхтавацца да выбарчай кампаніі, але тутака мясцовых скарбаў на гэту справу няма. Уся надзея на Вас.*

---

[299] *История Латвии*, Д. Блейере, И. Бутулис, А. Зунда и др., Рига 2005, с. 151.

[300] AAN, MSZ, t. 6194, k. 2–3.

[301] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 42, л. 4.

Калі дапаможаце, дык будзем мець сваіх дэпутатаў у Парламенце"[302]. Няма звестак, ці ўрад В. Ластоўскага як-колечы дапамог латвійскім беларусам у падрыхтоўцы да выбараў. Хутчэй за ўсё, гэта было немагчыма, бо палітыкі БНР у выгнанні самі былі ў цяжкай і няпэўнай сітуацыі.

На патрэбы парламенцкай кампаніі быў створаны Беларускі выбарчы камітэт (БВК) на чале з Міхалам Івановым. Беларусы выставілі кандыдатаў толькі ў адной акрузе – латгальскай. Беларускі спіс – № 21 (*Baltkrievu sarakst*) складаўся з 14 кандыдатаў: Кастуся Езавітава (інспектара беларускіх школ), Сяргея Сахарава (кіраўніка БША), Астапа Хруцкага (загадчыка Ляўдарскай беларускай школы), Дамініка Мяжэцкага (вясковага фельчара), Рыгора Чаркоўскага (сябра Істэрскай валасной управы, селяніна), Віталя Платача (сябра Рунданскай валасной управы), Міколы Стэймакова (шаўца), Міхала Сотчанкі (селяніна), Івана Паўловіча (сябра Інтэрскай валасной управы, селяніна), Паўла Блажэвіча (селяніна), Уладзіміра Ціханенкі (селяніна), Клімента Харчэнкава (селяніна), Паўла Крупенкава (селяніна), Фрола Мітрошчанкі (селяніна). Сярод беларускіх кандыдатаў было 10 сялян, 3 настаўнікі і 1 фельчар[303]. У агітацыйнай літаратуры Беларускага спісу з гонарам падкрэслівалася, што ён складаецца "*толькі з прадстаўнікоў працоўнай інтэлігенцыі, сялянства і гарадскіх рабочых*"[304]. З практычных меркаванняў БВК хацеў уключыць у свой спіс духоўную асобу. К. Езавітаў звярнуўся да кс. Я. Гайлевіча, але святар адмовіўся з прычыны адсутнасці латвійскага грамадзянства. Разам з тым, апошні лічыў пажаданым, каб у беларускім спісе быў каталіцкі святар, таму звярнуўся з адпаведнай прапановай да свайго знаёмага[305]. З невядомых прычын задума не была рэалізаваная. БВК разлічваў у першую чаргу на галасы вёскі, ведаючы, што гарадскі электарат не падтрымае Беларускі спіс. У адной з выбарчых улётак падкрэслівалася, што спіс № 21 складаецца "*не з гарадскіх панкоў, а прадстаўнікоў беларускага сялянства з валасцёў*"[306]. Адначасова ў дакуменце чытаем: "*на месцу ж* [у горадзе – ЕГ] *ёсць шмат выгоднай працы, якой карыстаюцца і на якой добра зарабляюць розныя асобы з горада (найбольш яўрэі) дзякуючы таму, што сяляне гэтых рамёстваў не ведаюць, бо не мелі магчымасці іх навучыцца*"[307].

Праграма БВК утрымлівала наступныя пастулаты: 1) перагляд аграрнай рэформы з прадстаўленнем сялянам права на абавязковы зямельны надзел без перасялення жыхароў Латгаліі ў Курляндыю і наадварот, прадстаўленне

---

[302] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1173.

[303] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 78, л. 2.

[304] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 78, л. 33.

[305] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 78, л. 44.

[306] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 78, л. 35.

[307] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 78, л. 35.

права арандатарам на тую зямлю, якую яны абраблялі, прадстаўленне права ўсім, хто перасяляецца на хутары, бясплатнага дрэва на новыя будынкі, прадстаўленне ўсім гаспадарам, якія пацярпелі ад вайны, доўгатэрміновай дзяржаўнай пазыкі на адбудову гаспадаркі; 2) аддзяленне рэлігіі ад дзяржавы; 3) права карыстацца роднай мовай у школах і дзяржаўных установах у мясцовасцях, дзе пражываюць беларусы; 4) замена падушнага падатку на падаходны; 5) рэформа школьнай праграмы з мэтай прыстасавання асветы да патрэб насельніцтва з увядзеннем у вясковых школах прадметаў па рамесніцтве, каб кожны вучань атрымліваў прафесійныя веды і ва ўмовах нястачы зямлі не мусіў эміграваць "у Амерыку і Бразілію", а зарабляў бы на хлеб на Бацькаўшчыне. Апрача таго, у адозве да выбаршчыкаў падкрэслівалася, што кожны абраны ў Сойм беларускі дэпутат будзе мець абавязак рэгулярна наведваць мясцовасці з беларускім насельніцтвам і знаёміцца з яго патрэбамі, ладзіць публічныя даклады і справаздачы пра сваю парламенцкую дзейнасць[308].

Агітацыю на месцах беларусы вялі праз сетку рэгіянальных аддзелаў таварыства "Бацькаўшчына" і беларускіх школ. З практычных меркаванняў перадвыбарчая агітацыя БВК вялася на рускай мове. Ва ўлётцы камітэта быў заклік да насельніцтва гуртавацца вакол таварыства "Бацькаўшчына" і Беларускага школьнага аддзела. Аўтары пераконвалі выбаршчыкаў-беларусаў галасаваць за свой нацыянальны спіс: "*Будут у нас дельные, честные представители, и мы можем быть спокойны за свое существование; у нас будут тогда лица, к которым каждый белорусс с далёкой деревни может обратиться са советом, найти поддержку и защиту. Долг каждого интеллигентного белорусса приложить теперь все усилия к тому, что бы разъяснить белорусскому населению всю важность и ответсьвенность переживаемого перед выборами в Сойм момента. Объединятйтесь же, белоруссы, без различия вероисповедания, чувствуйте себя свободными гражданами демократической Латвии, сбросьте с себя приниженость и дружно отстаивайте свои национальные интересы*"[309]. Ва ўлётцы быў заклік не верыць абяцанням іншых кандыдатаў, якім галасы беларускіх сялян патрэбныя толькі каб трапіць у Сойм, дзе яны потым будуць рабіць уласныя інтарэсы. Падкрэслівалася, што толькі беларускі дэпутат зможа паспяхова абараняць правы свайго народа[310].

Акцэнт на сацыяльна-эканамічных патрэбах быў невыпадковы. Беларускія сяляне не надта цікавіліся палітыкай, яны змагаліся з паўсядзённымі

---

[308] К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, Рыга 1927, с. 84; *Biełarusy u Łatwii,* "Krynica" 1922, № 4 z 21 vieraśnia, s. 7.

[309] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l.; НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 78, л. 33.

[310] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 78, л. 26.

цяжкасцямі, каб выбіцца з галечы. Невыпадкова беларуская прэса на кожным кроку крытыкавала аграрную рэформу[311].

Акрамя выбарчай улёткі, скіраванай да сялянства, дзеячы БВК выдалі некалькі адозваў да настаўнікаў. У адной з іх звярталася ўвага на прысутнасць педагогаў сярод кандыдатаў спісу № 21. Адзначалася, што гэтыя дэпутаты ў парламенце будуць гарантам абароны юрыдычных і матэрыяльных інтарэсаў настаўніцтва[312]. 25 верасня 1922 г. Беларускі выбарчы камітэт выдаў зварот да сяброў таварыства "Бацькаўшчына" і настаўніцтва з заклікам падтрымаць спіс № 21. Аўтары падкрэслівалі, што з'яўленне беларускіх прадстаўнікоў у Сойме будзе мець асаблівае значэнне ва ўмовах, калі некаторыя палітыкі намагаюцца давесці, што беларусаў у Латвіі не існуе. Адзначалася, што становішча латвійскіх беларусаў будзе тым мацнейшае, чым больш галасоў збярэ беларускі спіс. БВК рэкамендаваў сваім прыхільнікам: 1) накіраваць у мясцовыя выбарчыя камісіі сваіх прадстаўнікоў у якасці назіральнікаў; 2) растлумачыць насельніцтву, якое хоча падтрымаць канкрэтнага кандыдата, што ў беларускім спісе ёсць яшчэ 11 вольных месцаў, таму выбаршчыкі могуць упісваць у спіс № 21 сваіх кандыдатаў; 3) правесці агітацыю сярод сялянства; 4) у дзень выбараў прасачыць, каб сяляне выканалі свой грамадзянскі абавязак[313].

Беларускія дзеячы намагаліся нейтралізаваць агітацыю непрыхільных латгальскіх партый. У цыркуляры да сяброў таварыства "Бацькаўшчына" БВК перасцерагаў, што некаторыя латгальскія палітыкі імкнуцца не толькі правесці ў Сойм сваіх кандыдатаў, але і давесці, што беларусаў у Латгаліі не існуе: "*Ясно, что если этот обман удастся, то нас ожидают многия неожиданности до запрещения пользоваться своим языком включительно, ибо зачем пользоваться языком национального меншинства, там, где люди голосуют за латышские списки и значит (...) что сами считают себя латышами*"[314].

Адначасова дзеячы БВК шукалі паразумення з прадстаўнікамі іншых выбарчых спісаў, якія разглядаліся як прыхільныя да беларусаў. У іх лік уваходзілі некаторыя прадстаўнікі дэмакратычнага крыла рускай меншасці, стараверaў і латгальскіх дзеячаў. Задоўга да выбараў – увесну 1922 г. – К. Езавітаў кантактаваў з Рускім таварыствам у Латвіі і Нацыянальна-дэмакратычным саюзам рускіх грамадзян г. Рыгі (НДС) і ў якасці ганаровага госця ўдзельнічаў

---

311 P. Łossowski, *Łotwa nasz sąsiad. Stosunki polsko-łotewskie w latach 1918–1939*, Warszawa 1990, s. 21; J. Albin, *Polski ruch narodowy na Łotwie w latach 1919–1940*, Wrocław 1993, s. 24. J. Albin, *Polski ruch narodowy na Łotwie w latach 1919–1940*, Wrocław 1993, s. 40.

312 НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 78, л. 15; LVVA, 2125 f., 5 apr., 38 l., 503 lp.

313 НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 78, л. 17.

314 НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 78, л. 34.

ва ўрачыстасцях, прысвечаных гэтым арганізацыям[315]. Старшынёй управы НДС з'яўляўся адвакат і сябра Устаноўчага схода Латвіі Аляксандр Багачоў, з якім К. Езавітаў дамовіўся пра супрацоўніцтва ў падчас перадвыбарчай кампаніі. У выніку выбарчы камітэт спіса № 13 ("Адзіны рускі спіс"), які складаўся з сяброў НДС, 17 верасня 1922 г. прыняў рашэнне перадаць рэшту сваіх галасоў на карысць беларускага спіса. У выпадку перамогі рускага спіса беларусы пагадзіліся перадаць ім рэшту галасоў адданых за беларускі спіс[316]. У выніку гэтага супрацоўніцтву рускаму спісу ўдалося правесці ў парламент двух кандыдатаў[317]. Пасля таго, як А. Багачоў трапіў у Сойм, ён захоўваў пазітыўнае стаўленне да беларускіх спраў. Увесну 1923 г. ён з соймавай трыбуны выступіў у абарону беларусаў[318]. У якасці прыязнага кроку БВК раіў прыхільнікам на канцы спіса дапісаць наступных кандыдатаў: 154 – Валерыю Сейле (са спіса № 7, Латгальская сялянская партыя на чале з Уладзіславам Рубульсам), 226 – Баляслаўса Мігленікса (са спісу № 10, Латгальскае народнае аб'яднанне), 303 – Аляксандра Багачова (са спісу № 13, Адзіны рускі спіс), 325 – Леаніда Прадцечанскага (са спіса № 13), 352 – Мілеція Калістратава (са спіса № 15, Цэнтральны камітэт па справах стараабрадцаў Латвіі). Заслугоўвае ўвагі таксама тое, што сябра таварыства "Бацькаўшчына" Я. Кастылюк стартаваў са спіса № 16 (Рускі беспартыйны аб'яднаны спіс на чале з Уладзімірам Прасняковым). Ён займаў чацвёртую пазіцыю (№ 382) у спісе рускай меншасці[319].

Не маючы ўласнай прэсы, БВК папрасіў адну з віленскіх беларускіх газет надрукаваць інфармацыю пра выбарчую кампанію беларусаў з мэтай распаўсюду ў Латгаліі[320]. Аднак крыніцы не пацвярджаюць факту такой публікацыі. Тым часам, дакладна вядома, што перадвыбарчую агітацыю БВК пагадзілася надрукаваць руская газета "Маяк" (орган прыхільнікаў Адзінага рускага спіса)[321].

Дзеячы БВК не хавалі, што "пры дружным галасаванні" плануюць правесці ў парламент двух кандыдатаў[322]. Рэальнасць, аднак, зверыфікавала надзеі беларусаў. 7–8 кастрычніка 1922 г. адбыліся выбары, якія паказалі, што перадвыбарчая кампанія БВК скончылася паразай. У Лудзы за спіс № 21

---

[315] У сакавіку 1922 г. К. Езавітаў атрымаў ад Выканкама Нацыянальна-дэмакратычнага саюза запрашэнне на імшу архіепіскапа рыжскага і ўсяе Латвіі Іоана, якая адбылася з нагоды першай гадавіны дзейнасці арганізацыі. НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 10, л. 1.

[316] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 78, л. 49, 52.

[317] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 54, л. 2.

[318] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 54, л. 2.

[319] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 78, л. 34.

[320] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 78, л. 50.

[321] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 178, л. 12, 13.

[322] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 78, л. 34.

прагаласавала 108 чал. Для параўнання палякі атрымалі 198, а "Аб'яднаны рускі спіс" – 227. Больш галасоў за беларусаў атрымалі агульналатвійскія, латгальскія і габрэйскія спісы[323]. Разам па Латгальскай выбарчай акрузе за беларускі спіс прагаласавала 1 548 чал. Гэты вынік быў адным з найгоршых у Латгаліі. Ніводзін беларускі кандыдат не трапіў у Сойм[324].

Прычыны паразы былі прадметам аналізу. Кастусь Езавітаў лічыў, што галоўную віну нясуць самі беларусы. Ён сцвярджаў, што мясцовая беларуская інтэлігенцыя не ўсведамляла важнасці выбараў і не прыклала намаганняў, каб належна падрыхтаваць кампанію. Абмежаваліся выданнем улётак і праграмы накладам 9 тыс. асобнікаў. Беларускія кандыдаты не зладзілі ніводнага мітынгу і сустрэчы з выбаршчыкамі. Складана не пагадзіцца з С. Сахаравым, які канстатаваў, што няўдачы беларускага спіса вынікалі і з арганізацыйнай кволасці ды недасведчанасці мясцовага беларускага руху[325]. Належыць таксама адзначыць пасіўнасць латгальскага сялянства. У невялікіх мясцовасцях, далёка ад выбарчых участкаў, сяляне ўвогуле праігнаравалі выбары. Пазней К. Езавітаў пісаў: "*Наогул жа аб соймавых выбарах 1922 г. трэба сказаць, што яны прайшлі неяк міма беларусаў, не ўскалыхнуўшы жыцця беларускае меншасці: На вёсках дужа значны працэнт сялянства зусім не прымаў удзелу ў галасаванні, свядомая беларуская інтэлігенцыя больш аддавала сіл і часу школьна-асветнай працы, а на справу правядзення свайго дэпутата ў Сойм не звярнула ўвагі*"[326]. 16 жніўня 1922 г. К. Езавітаў наступным чынам інфармаваў прэм'ера БНР пра вынікі перадвыбарчай дзейнасці: "*Мы цяперака ў паласе выбараў: валасных, мястовых, парламенцкіх. Валасныя прайшлі – нішто, апрача двох-трох валасцёў, дзе нас пабілі палякі і маскалі. Мястовыя – пачаліся (з іх Люцын – прайшоў добра). Парламенцкія – насоўваюцца і хутка будзе падача спіскаў. У звязку з гэтым вельмі прашу Вас, каб пярэсланыя мной, – праз Акермана і Вальковіча, – рахубы – былі срочна, самым тэрміновым парадкам, задаволены і выдаткі звернуты. Аб дапамозе зверх таго, што мне належыць, я ўжо і не прашу. Здаецца – безнадзейнасць поўная. Незадавальненне ж пасланых рахубаў будзе нам вельмі шкодна, а магчыма, і трагічна скіруе самыя выбары. Палякі і расейцы гуртуюцца і збіраюцца даць бой па ўсіх правілах. Сыплюцца: грошы, кляўзы, газеты, лістоўкі, лаянка, агітацыя і закіды. Мы – маўчым. Няма 'свабодных' магчымасцяў.*

---

[323] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 78, л. 54.

[324] Менш як беларускі спіс галасоў атрымалі толькі некалькі выбарчых камітэтаў, у тым ліку – спіс "Латгальскія гаспадары", Габрэйская працоўная партыя, Аб'яднанне рускіх беспартыйцаў. *Latvijas Republikas Saeimas vēlēšanas 1922 gadā*, tekst un redakcija M. Skujenieka, Rīgā 1923, s. 10.

[325] *По поводу статьи 'Белорусския похоронныя дроги'*, "Рижский курьер" 1923, № 632, с. 2.

[326] К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, Рыга 1927, с. 84.

Казённыя кошты астаюцца казённымі і ідуць на выдаткі бюджэтна-сметныя. Не маю часу на дробныя тлумачэнні, бо страшэнна спяшаюся (з 15 дзён гэтага месяца я ўжо 12 дзён быў у дарозе і раз'ездах)"[327].

Да паразы беларусаў спрычынілася, на думку К. Езавітава, і несумленная кампанія з боку "*славянскіх братоў беларусаў з польскага і велікарускага табару, якія без лішніх братніх сантыментаў не спыняліся ні перад чым, каб абаламуціць беларускае сялянства і захапіць частку ягоных галасоў*"[328]. Галоўнымі канкурэнтамі беларусаў былі кандыдаты, якія прадстаўлялі агульналатвійскія, латгальскія, польскія і рускія партыі і выбарчыя камітэты. Паказальны тут прыклад дзейнасці Польскага выбарчага камітэта. У Латгаліі беларускі спіс здабыў 38 709 выбарчых купонаў (за К. Езавітава – 1 795, за С. Сахарава – 1 953), а польскі – ажно 238 479. У Латагліі за польскі спіс прагаласавала 9 541 чал. Гэтым самым палякі атрымалі 6-разовую перавагу над беларусамі. Нагадаем, што паводле перапісу насельніцтва ў 1920 г. у трох латгальскіх паветах жыло 55 132 беларусаў і 27 220 палякаў[329].

Палякі і беларусы па-рознаму інтэрпрэтавалі вынікі выбараў. Паводле беларускіх актывістаў, сяляне з нізкім пачуццём нацыянальнай свядомасці засталіся глухімі да заклікаў беларускіх дзеячаў і падчас выбараў з большым жаданнем галасавалі за польскіх кандыдатаў, якія абяцалі ім больш. Васіль Руднікаў пісаў К. Езавітаву, што ў Рунданскай воласці "*наш спісок № 21 не прыцягнуў да сябе не толькі болей ці меней усіх беларусаў, але навет і дзясятай часткі галасоў (...) Прычынай такога малога ліку паданых галасоў за спісок № 21 служаць розныя прычыны. Першая і галоўная прычына гэтага адсутнасць нацыянальнага самапазнавання сярод нашага сялянства, дзякуючы чаму нашы галасы рассейваліся і прыцягваліся іншымі спіскамі, паборнікі якіх раз'язджалі сярод сялян, абяцаючы шмат добрага, запрашалі галасаваць за іх спіскі. Так асабліва настаяцельна вялі агітацыю ксяндзы, якія раз'язжалі па прыходах і з касцёльных трыбун заклікалі галасаваць за спіскі № 9 і № 14. Больш працэнтаў галасоў каля 60% сабраў № 3, які надта хутка пашыраў папулярнасць сваю і гэтым станавіўся на шляху № 21 перашкодаю. Ад многіх прыходзілася чуць такія незадавальненні, што некалькі асоб выстаўленых у спіску № 21 ім знаёмых, зусім не адказваючых іх інтарэсу, як напрыклад Хруцкі, Мяжыцкі, Чаркоўскі. Першы калісь-то ў часы панскага валадання для сялян рабіў розныя непрыемнасці, а двое апошніх акрамя гарэлкі мала чым цікавяцца. Так давалі многія сяляне характарыстыку для некаторых ім знаёмых асоб № 21*"[330].

---

[327] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1337.

[328] К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, Рыга 1927, с. 84.

[329] J. Gierowska-Kałłaur, *op. cit.*, s. 216.

[330] LVVA, 2125 f., 5 apr., 200 l., 7 lp.

Польскія ж дзеячы расцэньвалі вынікі галасавання як сведчанне пра прыналежнасць выбаршчыкаў да польскай нацыянальнасці[331]. Няўдачы беларусаў у выбарчых кампаніях палякі разглядалі як доказ таго, што колькасць беларусаў у Латвіі значна завышаная, а мясцовы беларускі рух гэта "штучная з'ява". Калі б афіцыйная лічба беларусаў у Латвіі адпавядала рэчаіснасці, падкрэслівалі польскія дзеячы, дык беларускія кандыдаты бесперашкодна трапілі б у Сойм. А так польскія кандыдаты атрымалі падтрымку ў мясцовасцях, дзе, паводле вынікаў перапісу 1920 г., беларусы складалі пераважную большасць. У рапарце Таварыства крэсавай варты чытаем: "*Досыць характэрны прыём меў прадстаўнік польскага спіса ў беларускіх гмінах Лудзенскага павета. Лудзенскі павет лічыцца бастыёнам беларускай акцыі. Вось жа ў Істранскай, Янаўскай, Рунданскай валасцях прадстаўнік польскага спіса сустрэўся з надзвычай прыхільным прыёмам беларускага насельніцтва. Адзінай петыцыяй і адзінай тэмай была справа стварэння польскіх школ, неаднаразова выказваліся просьбы напісання заявы аб адкрыцці польскіх школ і г.д. Да навязаных ім беларускіх школ ставяцца вельмі непрыхільна і з дзвюх бед абіраюць часцей рускую школу, чым беларускую*"[332]. Польскі дзеяч Ян Вяжбіцкі, які трапіў у Сойм, лічыў, што выбары расставілі кропкі над "і", паказаўшы, што значную частку латвійскіх беларусаў складаюць "*не сапраўдныя беларусы, а толькі запісаныя беларусамі ў пашпартах, якія аддалі свае галасы палякам і латгальцам*"[333].

Належыць, аднак, з асцярогай ставіцца да сцвярджэння, што палітычная прыхільнасць падчас выбараў сведчыла пра нацыянальную самаідэнтыфікацыю. Большасць "тутэйшых" галасавала не за польскі ці беларускі спіс, а за латвійскія партыі (агульнадзяржаўныя і мясцовыя латгальскія), якія ішлі на выбары не з нацыянальнымі, а з сацыяльнымі і рэлігійнымі лозунгамі. Гэта аднак не азначала, што беларускамоўныя жыхары Латгаліі лічылі сябе латышамі ці латгальцамі. За латвійскія і латгальскія партыі галасавала таксама шмат палякаў. На думку польскіх дзеячаў, у выбарах узяло ўдзел толькі 50–60% тых, каго польскія дзеячы залічвалі да сваіх суродзічаў. З гэтай лічбы больш як палова прагаласавала за польскі спіс, а астатнія аддалі галасы латвійскім і латгальскім кандыдатам. Калі б усе польскія выбаршчыкі падтрымалі польскі спіс, дык у Сойм можна было б правесці 4–5 дэпутатаў, а не 2–3 як гэта было ў рэчаіснасці[334]. Ежы Ружыцкі лічыў вынікам пасіўнасці польскага насельніцтва, выкліканай кепскім эканамічным становішчам[335]. І гэта пры

---

[331] J. Różycki, *op. cit.*, s. 5.

[332] Цыт.: J. Gierowska-Kałłaur, *op. cit.*, s. 214–215.

[333] Я. Вержбицкий, *Еще о латвийских белоруссах*, "Рижский курьер" 1923, № 642.

[334] J. Albin, *Polski ruch narodowy…*, s. 71.

[335] J. Różycki, *op. cit.*, s. 15.

тым, што польскія дзеячы мелі большыя за беларусаў магчымасці і сродкі на падрыхтоўку перадвыбарчай кампаніі. Шукаючы адказу на пытанне, чаму воласці, якія па нацыянальным складзе лічыліся беларускімі, галасавалі за польскіх кандыдатаў, варта памятаць, што шмат залежала ад арганізацыйных здольнасцей і актыўнасці выбарчых штабоў. За колькі дзён да выбараў Польскі выбарчы камітэт выдаў улёткu на рускай мове, адрасаваную беларусам[336]. Гэты дакумент не толькі ўтрымліваў заклік галасаваць за польскі спіс, але і зневажаў беларускіх дзеячаў. Падамо змест гэтай улёткі: "*И так, братья белоруссы, подадим друг другу руки, сплотися в одну громаду и будет нас сила. Не будем слушать наших врагов, наускивающих и травящих нас друг на друга. Довольно их сказок. И так, братья белоруссы, пойдем вместе, слушайте сами себя и нас, а не вожаков из № 21, кои вашими голосами хотят получить теплые места, стать Вашими панами, вговорить Вам православие и погнать Ваших детей в русско-кацапские школы*"[337]. У адказ К. Езавітаў звінаваціў у прэсе польскі бок у несумленнай гульні. Польскі дэпутат Я. Вяжбіцкі, які на старонках газеты "Рижский курьер" бараніўся ад закідаў беларускага дзеяча, не пажадаў, аднак, каментаваць з'яўлення ўлёткі. Ён даводзіў, што яму нічога не было вядома пра яе існаванне[338]. З пададзенай вышэй сітуацыі можна зрабіць выснову, што перамога польскага спіса ў беларускамоўных валасцях Латгаліі сведчыць хутчэй пра палітычны спрыт польскіх кандыдатаў, чым пра наяўнасць у тамтэйшых жыхароў польскай нацыянальнай свядомасці.

Істотны ўплыў на выбарчыя прыхільнасці сялян мела агітацыя, якая ажыццяўлялася з амбона. Частка беларускамоўных латгальскіх каталікоў галасавала за кандыдатаў з клерыкальнага спіса № 9 (Латгальскі хрысціянскі сялянскі саюз на чале з Францісам Трасунсам). Святары карысталіся падтрымкай перадусім вясковых выбаршчыкаў старэйшага пакалення. Найбольшую колькасць галасоў у Латаглii (47 202 чал.) атрымалі Латгальскія хрысціянскія сяляне (ЛХС).[339] Тым часам, на моладзь значна ўплывалі латвійскія сацыял-дэмакраты (№ 3)[340]. Падчас выбараў 1922 г. ЛСДРП атрымала 30% галасоў вясковага насельніцтва[341]. Сацыял-дэмакраты заклікалі сялянства

---

[336] J. Albin, *Polski ruch narodowy…*, s. 70.

[337] К. Езавітаў, op. cit., с. 85; *Письмо в редакцию*, "Рижский курьер" 1923, № 654, с. 3; НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 78, л. 57.

[338] Я. Вержбицкий, *Ответ г. Езовитову*, "Рижский курьер" 1923, № 654, с. 3.

[339] *Latvijas Republikas Saeimas vēlēšanas 1922 gadā*, tekst un redakcija M. Skujenieka, Rīgā 1923, s. 10.

[340] J. Gierowska-Kałłaur, *Stosunek państwa łotewskiego do miejscowych Polaków i Białorusinów w początkach niepodległości łotewskiej*, "Studia z dziejów Rosji i Europy Środkowo-Wschodniej" 2011, t. 46, s. 214.

[341] P. Łossowski, *Łotwa nasz sąsiad. Stosunki polsko-łotewskie w latach 1918–1939*, Warszawa 1990, s. 69.

і рабочых не галасаваць за клерыкалаў са спіса № 9, а таксама за рускіх манархістаў са спісаў № 15 і № 16. Аднак іх выбарчая агітацыя, якая мела выразную сацыяльна-эканамічную афарбоўку, ускосна шкодзіла таксама беларускаму спісу, бо была прывабнай для незаможнай латгальскай вёскі[342]. У Латгаліі за ЛСДРП прагаласавала 35 740 чал. Такім чынам, сацыял-дэмакраты апынуліся на другім месцы (пасля латгальскіх клерыкалаў) па колькасці галасоў, атрыманых у правінцыі. У Прыдруйскай воласці клерыкалы і сацыял-дэмакраты атрымалі адпаведна: 785 і 503 галасы. У Даўгаўпілсе вынікі былі наступныя: ЛСДРП – 65 324 выбарчых талонаў, спіс № 9 – 7 150, Латгальская сялянская партыя – 1 819, беларускі спіс – 938, польскі спіс – 83 884, спіс № 16 – 9 797[343]. Значную падтрымку атрымалі мясцовыя Латгальская працоўная партыя (№ 4) (27 679 галасоў), Латгальская сялянская партыя (8 522) і Латгальскае народнае аб'яднанне (6 422)[344]. Вышэйзгаданыя партыі вялі перадвыбарчую агітацыю на рускай мове, прызнаючы нацыянальна-культурную аўтаномію нацменаў. Кандыдаты спіса № 7 (Латгальская сялянская партыя) уключылі ў праграму права меншасцей да выкарыстання роднай мовы ў школе і дзяржаўных установах[345]. Тым часам кандыдаты спіса № 13 звярталіся на рэлігійных пачуццяў выбаршчыкаў, акрэсліваючы свой электарат як "праваслаўныя" і "рускія"[346].

Нягледзячы на тое, што беларускай меншасці не ўдалося правесці прадстаўніка ў парламент, нельга сказаць, што ўдзел у выбарах быў дарэмным. Упершыню латвійскія беларусы зрабілі спробу заявіць пра свае правы ў палітыцы. Больш удала прайшлі выбары ў мясцовае самакіраванне ў 1922 г. Беларусам удалося правесці некалькі прадстаўнікоў. У Лудзенскую гарадскую думу быў абраны С. Сахараў[347] і Еліструт Чарняўскі, Даўгаўпілскую – К. Езавітаў, у Краслаўскую – С. Красневіч[348].

---

[342] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 78, л. 5.

[343] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 173, л. 3.

[344] *Latvijas Republikas Saeimas vēlēšanas 1922 gadā*, tekst un redakcija M. Skujenieka, Rīgā 1923, s. 10; *Итоги выборов в Сойм*, "Свободная мысль" 1922, № 18 от 21 октября, с. 2.

[345] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 78, л. 10; Тамсама, спр. 178, л. 6.

[346] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 78, л. 11.

[347] *Беларусы ў Латвіі*, "Наша будучыня" 1922, № 1 ад 8 снежня, с. 4.

[348] У лісце К. Езавітава (1 студзеня 1924 г.) В. Захарку і П. Крачэўскаму чытаем: "*Нацыянальная справа нашая тутака, як меншасці, мяне зусім яшчэ не задавальняе, мы павінны наладзіць працу ў усіх трох галінах жыцця кожнага народа: нацыянальна-прасветны, эканамічны і палітычны. На жаль, да гэтага часу эканамічная праца ў нас яшчэ зусім не пачата. Палітычнага жыцця мы амаль-што зусім не ведаем, хоць такія, сякія справы ў гэтым напрамку былі. Мы маем гласных у Дзвінскай гарадское думе (К. Езавітаў), у Люцынскай думе (Сахараў і Чарняўскі), у Краслаўскай (Красневіч). Рабілі спробу правесці свайго кандыдата ў сейм, але, дзякуючы адсутнасці патрэбнай арганізацыі, праваліліся. У напрамку гэтым (палітычным)*

Пасля паразы на выбарах у Сойм I склікання беларусы не адмовіліся ад спроб трапіць у латвійскі парламент. Падзеі, звязаныя з беларускім працэсам, давялі нацыянальным дзеячам, што толькі ўласныя прадстаўнікі ў органах дзяржаўнай і мясцовай улады могуць адстойваць інтарэсы беларускай меншасці. У першым нумары газеты "Голас беларуса" К. Езавітаў адзначаў: "*І вось у 4-я ўгодкі нашае нацыянальна-адраджэнчае працы ў Латвіі, мы павінны даць сабе ясную справаздачу ў тым, што мы далей не можам абмяжоўвацца выключна працаю культурна-прасветнаю, што само жыццё і асабліва самыя ворагі нашыя прымушаюць нас выйсці і на шлях працы нацыянальна-палітычнае, а за ёй і працы эканамічнае. Гэткім чынам, рух наш у Латвіі перастае быць аднабокім. Мы выходзім з таго стану, калі займаліся толькі працай культурнай і робімо, нарэшце, першыя крокі на шляху палітычным і сацыяльна-эканамічным*"[349]. Тым часам у лісце да амерыканскіх беларусаў К. Езавітаў дзяліўся сваімі ўражаннямі: "*Тутака справа ўжо пайшла. Мы маемо сваіх вучыляцёў. Маемо школы. Маемо ўжо і студэнцтва. Культурна-прасветная праца забяспечана. Пераходзімо ўжо і да эканамічнае працы. Распачалі працу палітычную (...) Беларусы ў Латвіі ўжо – існуючы факт, з якім прымірыліся і ворагі*"[350].

Увесну 1925 г. пачалася падрыхтоўка да выбараў у Сойм II склікання. 24 красавіка ў Рызе, у сядзібе таварыства "Рунь", адбыўся сход, у якім узялі ўдзел К. Езавітаў, Я. Шчорс, А. Родзька, Р. Плыгаўка, Н. Пінская, Л. Клагіш. Паслухаўшы рэферат К. Езавітава пра патрэбу палітычнай арганізацыі, прысутныя прынялі рашэнне стварыць Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў (ТБВ) у Дзяржаўны Сойм, гарадскія, павятовыя і валасныя самаўрады ў Латвіі *(Latvijas Saeimas, pilsētu, apriņķu un pagastu pašvaldību baltkrievu vēlētāju biedrība)*. Удзельнікі ўхвалілі статут, які быў высланы на зацвярджэнне МУС[351]. Дакумент быў зацверджаны 20 траўня 1925 г.[352]

Мэты таварыства акрэсліваліся ў статуце наступным чынам: "*З поваду таго, што беларуская нацыянальная меншасць у Латвіі дае найбольшы працэнт няграматных сялян і рабочых выбаршчыкаў, якія дужа часта – па сваёй несвядомасці, неарганізаванасці, няграматнасці і адсутнасці добра нарыхтаванае інфармацыі – не толькі зусім па выпадковых пабуджэннях галасуюць за той ці іншы спісак, але нават і зусім адхіляюцца ад удзелу ў выбарах, – Таварыства ставіць сабе мэтай аб'яднанне беларусаў выбаршчыкаў у Дзяржаўны Сойм,*

нам яшчэ патрэбна шмат працаваць і працаваць нацыянальна не драбяся ні на якія партыі. Тады голас будзе мець вагу". ГАРФ, ф. 5875, оп. 1, д. 11, л. 431.

[349] *1921–1925*, "Голас беларуса" 1925, № 1, с. 1.

[350] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 243 lp.

[351] LVVA, 3009 f., 1 apr., 3 l., 6–7 lpp.

[352] *Беларускі працэс у Латвіі*, "Голас беларуса" 1925, № 1 ад 10 чэрвеня, с. 4.

у гарадскія, павятовыя і валасныя самаўрады, каб даць беларускай меншасці магчымасць папярэдняга абмену думак, абгаворвання сваіх эканамічна-сацыяльных і нацыянальна-культурных патрэбаў, выстаўлення адпаведных беларускіх кандыдатур"[353]. На старонках газеты "Голас беларуса" К. Езавітаў наступным чынам патлумачыў стварэнне ТБВ: "*З поваду таго, што нацыянальныя меншасці ў Латвіі адсунуты прадстаўнікамі латышскай большасці ў Дзяржаўным Сойме ад удзелу ў працы ўрадовай, а знача і не могуць прымаць чыннага ўдзелу і адказнасці ў працы агульнадзяржаўнай, беларусам, як і кожнай меншасці, астаецца дужа малое поле для палітычнае працы. – Уся беларуская 'палітыка' зводзіцца і павінна звадзіцца да грамадскае абароны сваіх нацыянальна-культурных правоў, як меншасці, ды сацыяльна-эканамічных інтарэсаў беларускіх працоўна-сялянскіх масаў. У гэтай сваёй барацьбе беларусы шукаюць і выбіраюць зусім лаяльныя шляхі, прадугледжаныя і намечаныя латвійскай канстытуцыяй. Да ліку гэтых шляхоў належыць перш за ўсё прадстаўніцтва беларускіх інтарэсаў у розных мясцовых самаўрадах, а затым і ў Дзяржаўным Сойме і ягоных камісіях. Вось чаму, калі беларусы дайшлі да свядомасці неадкладнае патрэбы ўтварэння свае нацыянальна-палітычнае арганізацыі ў Латвіі, дык яны залажылі сабе Таварыства, якое ставіць сваёй мэтай правядзенне выбараў ад беларускае меншасці ў мясцовыя самаўрады і Дзяржаўны Сойм. Адналітнасць беларускае нацыянальнае меншасці ў Латвіі, складзенай выключна з працоўных элементаў – сялян, рабочых і працоўнае інтэлігенцыі, – прывяло да таго, што беларусам не патрэбна было разбівацца на партыі і групы і праграма таварыства была прынята бяз спрэчак, бо адпавядала патрэбам усяе беларускае меншасці*"[354].

Згодна са статутам, арганізацыя магла праводзіць публічныя і зачыненыя лекцыі, сходы і дыскусіі; ладзіць кангрэсы, з'езды і нарады; выдаваць газеты, адозвы, праграмы, інструкцыі і іншую літаратуру; выстаўляць кандыдатаў на парламенцкіх і мясцовых выбарах; дэлегаваць прадстаўнікоў у камісіі і камітэты па выбарах; ладзіць вечарыны, шэсці, культурныя мерапрыемствы, латарэі, курсы; стварацьбібліятэкі, спартовыя секцыі, хоры, драматычныя, музычныя і навуковыя гурткі. Сябрамі ТБВ маглі быць асобы беларускай нацыянальнасці не маладзейшыя за 18 гадоў. Вышэйшым органам таварыства лічыўся З'езд дэлегатаў (1 дэлегат ад 10 сяброў аддзела), на якім абіралася цэнтральная ўправа. Апошняя складалася з пяці сяброў і трох кандыдатаў[355].

---

[353] *Статут Таварыства беларусаў – выбаршчыкаў у Дзяржаўны Сойм, гарадскія, павятовыя і валасныя самаўрады ў Латвіі* [у:] *Крывіцкія руны. Вып. II: Беларускі культурны мацярык у Латвіі*, рэд. М. Казлоўскі, С. Панізнік, Менск 2017, с. 356; НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 83, л. 11–12.

[354] *Беларускае жыцьцё*, "Голас беларуса", 1925, № 8 ад 7 жніўня, с. 4.

[355] *Статут Таварыства белаурсаў-выбаршчыкаў у Дзяржаўны Сойм, гарадскія, павятовыя і валасныя самаўрады ў Латвіі* [у:] *Крывіцкія руны. Вып. II: Беларускі культурны мацярык у Латвіі*, рэд. М. Казлоўскі, С. Панізнік, Менск 2017, с. 356–361.

Сядзіба арганізацыі знаходзілася ў Рызе па адрасе *Alberta iela 5/9*), пазней – *Mazā Kalna iela 14/16, dz. 6*[356].

Сваёй дзейнасцю арганізацыя ахоплівала ўсю Латвію. Ужо ўвесну 1925 г. пачалася арганізацыйная праца ў правінцыі. Сведчаць пра гэта лісты і заявы жыхароў Даўгаўпілшчыны ў цэнтральную ўправу. Рэгіянальны філіял мог быць створаны пры наяўнасці не менш як 15 сяброў. Ахвотныя ўступіць у ТБВ мусілі напісаць калектыўную заяву пра стварэнне аддзела і даслаць у цэнтральнае праўленне ў Рызе. Заахвочваючы жыхароў Латгаліі ўступаць у арганізацыю К. Езавітаў пісаў: "*Ад імя Цэнтральнага Праўлення заклікаю Вас да шчырай і энергічнай працы над згуртаваннем нашага беларускага сялянства, якое ў Латвіі да гэтага часу зусім не было сарганізавана і таму цярпела вялікія крыўды з усіх бакоў*"[357]. На трэцім сходзе актыву таварыства 23 траўня 1925 г. было вырашана арганізаваць філіялы ў Рызе (Алесь Булат, Lāčplēša iela *155*), Даўгаўпілсе (Уладзімір Раткін, Šosejas iela *82*) і Лудзы (Ілля Фёдараў, *Latgales iela 64*)[358].

29 траўня 1925 г. адбыўся першы сход часовай цэнтральнай управы арганізацыі, падчас якога ў склад таварыства былі прынятыя 20 новых сяброў, у тым ліку – Сяргей Сахараў, Сцяпан Махноўскі, Мікола Талерка, Язэп Клагіш, Вольга Сахарава і інш.[359] Дзякуючы новым сябрам, да пачатку кастрычніка 1925 г. арганізацыя мела 16 філіялаў і гурткоў, у тым ліку – у Краславе (Лявон Квэст), Індры (з сядзібай у Вайцюлеве) (Ян Абалевіч, сакратар Мікалай Талерка), Пустыні (Данат Клагіш, сакратар Чэслаў Клагіш), Талоеўцах, Пасіене (Міхал Байкоўскі), Тартаках (П. Савіцкі), Міхалове (У. Ціхаміраў), Каплаве (Язэп Пятроўскі), Пупіках (Данат Клагіш, сакратар Часлаў Клагіш), Скрудаліне (Восіп Цімашонак). Дакладную колькасць сяброў таварыства складана вызначыць. Некаторыя філіялы былі шматлікімі. Напрыклад, філіял у Даўгаўпілсе налічваў 55 чал. Архіўныя крыніцы дазваляюць прасачыць храналогію стварэння і склад кіраўніцтва некаторых філіялаў. 29 траўня з'явіўся філіял у Даўгаўпілсе (У. Раткін (старшыня), С. Красневіч (сакратар), С. Сахараў, А. Махноўскі, К. Александровіч); 30 траўня – у Рызе (Алесь Булат, Пятро Вайноўскі, Ніна Пінская, Максім Апанасёнак і Віктар Рацын); 2 чэрвеня – у Лудзы (М. Іваноў, І. Фёдараў, Е. Чарняўскі, А. Шкульцін, Н. Талоцкі); 14 чэрвеня – у Краславе (Л. Квест, А. Красневіч, С. Красневіч, В. Бязручка, Г. Рудзіт)[360].

---

[356] *Крывіцкія руны. Вып. II: Беларускі культурны мацярык у Латвіі*, рэд. М. Казлоўскі, С. Панізнік, Менск 2017, с. 446.

[357] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l.

[358] LVVA, 3009 f., 1 apr., 3 l., 12 lp.

[359] LVVA, 3009 f., 1 apr., 3 l., 17 lp.

[360] LVVA, 3009 f., 1 apr., 3 l., 112–113 lpp.; *Беларускае жыцьё,* "Голас беларуса" 1925, № 1 ад 10 чэрвеня, с. 4; *Беларускае жыцьцё*, "Голас беларуса" 1925, № 2 ад 20 чэрвеня, с. 4.

Арганізацыя пазіцыянавала сябе як сіла сацыял-дэмакратычнага напрамку. Праграма ТБВ шмат у чым дублявала праграмныя пастулаты латвійскіх сацыял-дэмакратаў, але ў ёй больш месца аддавалася нацыянальнаму пытанню. Таварыства падтрымлівала латвійскую дэмакратычную дзяржаву, якая гарантавала правы і свабоды нацыянальным меншасцям. Падкрэсліваўся пастулат роўнасці беларускай меншасці з астатнімі нацыянальнымі групамі ў Латвіі. Акцэнтавалася ўвага на ўзаемнай павазе беларусаў і латвійскай дзяржавы паводле прынцыпу: беларуская меншасць выконвае грамадзянскія абавязкі ў адносінах да дзяржавы, а дзяржава забяспечвае меншасці роўныя правы. У праграме знайшлі адлюстраванне пытанні, звязаныя з асветай, працай і зямлёй. Дэкларавалася права беларусаў на школы з роднай мовай навучання: пачатковыя, сярэднія і спецыялізаваныя. Сярэднія і спецыялізаваныя (сельскагаспадарчыя, тэхнічныя, педагагічныя) школы павінны былі ўтрымлівацца за кошт дзяржаўнага бюджэту. Беларускія школы і тэатр мусілі атрымліваць дапамогу са сродкаў Культурнага фонду Латвіі, а таксама з бюджэту БША. Пазіцыя ТБВ у важным для беларусаў-сялян зямельным пытанні была наступная. Зямлёй павінны былі валодаць тыя, хто на ёй працаваў. Надзелы, якія гаспадар не выкарыстоўваў цягам трох гадоў, падлягалі вяртанню дзяржаве, а яна павінна была перадаць іх тым, хто хацеў працаваць на зямлі. Сяляне-беларусы павінны былі атрымаць зямлю паводле тых самых правіл, што і латышы. Для сялян, якія пацярпелі ў выніку вайны, прадугледжваўся меншы падатак на час адбудовы гаспадаркі Латгаліі[361].

Галоўнай крыніцай утрымання арганізацыі былі сяброўскія складкі. З прычыны незаможнасці не ўсе маглі своечасова іх плаціць. У сувязі з гэтым у верасні 1926 г. было вырашана зменшыць памер гадавых складак з 3 да 1 лата[362]. У 1925–1926 гг. прыбытак арганізацыі склаў 1 903 латы, з якіх 370 складалі сяброўскія складкі, 28 – пазыкі, 1 389 – прыбытак з латарэі, 115 – іншыя прыбыткі[363].

Нягледзячы на тое, што ТБВ стваралася з думкай пра парламенцкія выбары 1925 г., яно не абмінала ўвагай іншых спраў, датычных беларускай меншасці. Таварыства рэагавала на перапіс насельніцтва, які адбыўся ў тым жа годзе. 3 ліпеня 1925 г. цэнтральная ўправа арганізацыі звярнулася да грамадскасці з просьбай дасылаць сведчанні злоўжыванняў супрацоўнікаў Латвійскага статыстычнага ўпраўлення падчас перапісу – калі беларусаў запісвалі рускімі[364]. На пасяджэнні цэнтральнай управы 29 ліпеня разглядалася

---

[361] *Праграма Т-ва беларусаў-выбаршчыкаў у Дзяржаўны Сойм, павятовыя, гарадзкія і валасныя самаўрады ў Латвіі*, "Голас беларуса", 1925, № 10, с. 2; НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 83, л. 18–18 зв.

[362] LVVA, 3009 f., 1 apr., 3 l., 107 lp.

[363] LVVA, 3009 f., 1 apr., 3 l., 104 lp.

[364] *Беларускае жыцьцё*, "Голас беларуса" 1925, № 5 ад 17 ліпеня, с. 3.

справа Ніны Пінскай, якой чыноўнікі адмовіліся пазначыць у пашпарце беларускую нацыянальнасць, а ўзамен прапанавалі рускую альбо польскую[365]. 16 верасня 1925 г. цэнтральная ўправа ТБВ з ініцыятывы К. Езавітава выслала спачуванне латышскаму народу з нагоды смерці Зігфрыдса Мееровіцса[366].

Вернемся, аднак, да парламенцкіх выбараў. 2 жніўня 1925 г. у Даўгаўпілсе адбыўся І агульны з'езд дэлегатаў ТБВ, у якім узяло ўдзел 46 чал. (20 з правам голасу) ад 9 рэгіянальных філіялаў. На з'ездзе прысутнічалі чатыры прадстаўнікі паліцыі (у тым ліку 3 – палітычнай), што беларускі бок разглядаў як праяву павышанай увагі да беларусаў з боку гэтага органа[367]. Удзельнікі абралі цэнтральную ўправу арганізацыі ў наступным складзе: К. Езавітаў (старшыня), А. Булат, Я. Шчорс і Н. Пінская (сябры), Р. Плыгаўка (скарбнік), М. Дзямідаў, Я. Тэтар і Л. Клагіш (кандыдаты)[368]. Аднак галоўнае рашэнне з'езда тычылася ўдзелу ў мясцовых і парламенцкіх выбарах. Падчас дыскусіі К. Езавітаў адзначыў, што сацыяльная аднароднасць латвійскіх беларусаў (сяляне, рабочыя і працоўная інтэлігенцыя) выключае патрэбу палітычных падзелаў. Ён прапанаваў скласці адзіны беларускі выбарчы спіс[369].

Удзельнікі з'езда стварылі "Аб'яднаны сьпісак беззямельных, рабочых і малазямельных грамадзян беларусаў", які выставіў два спісы: № 30 – у Латгаліі і № 19 – у Земгаліі. Каментуючы склад кандыдатаў, кіраўніцтва арганізацыі падкрэслівала, што ў спіс трапілі толькі "*працоўныя беларускія элементы і нацыянальна-сацыяльныя дзеячы*". З 23 кандыдатаў 6 паходзіла з Рыгі, 7 – з Латгаліі і 10 – з Земгаліі. На першых месцах знаходзіліся: К. Езавітаў і С. Сахараў, трэцяе месца ў Латгаліі займаў Мікалай Байкоўскі, у Земгаліі – Мікалай Савіцкі[370]. Некаторыя кандыдаты адмовіліся выстаўляць кандыдатуры, бо ішлі па іншых спісах (Вікенцій Арцімовіч – па Латгальскай акрузе, Юльян Парваніцкі – па Земгальскай акрузе)[371]. Кіраўніцтва таварыства

---

[365] LVVA, 3009 f., 1 apr., 34–35 lpp.; *Пашпартныя перашкоды беларусам*, "Голас беларуса" 1925, № 7 ад 31 ліпеня, с. 1.

[366] LVVA, 3009 f., 1 apr., 3 l., 55 lp.

[367] *Зьезд дэлегатау Т-ва беларусау-выбаршчыкау*, "Голас беларуса" 1925, № 8 ад 7 жніўня, с. 1.

[368] LVVA, 3009 f., 1 apr., 31 lp., Пратакол І сходу дэлегатаў Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў у Дзяржаўны Сойм, гарадскія, павятовыя і валасныя самаўрады ў Латвіі, 2 VIII 1925; *Зьезд дэлегатау Т-ва беларусау-выбаршчыкау,* "Голас беларуса" 1925, № 8 ад 7 жніўня, с. 1.

[369] *Зьезд дэлегатау Т-ва беларусау-выбаршчыкау*, "Голас беларуса" 1925, № 8 ад 7 жніўня, с. 1.

[370] Спіс № 30 утрымліваў прозвішчы 11 кандыдатаў: К. Езавітаў, С. Сахараў, Мікалай Байкоўскі, Міхал Клагіш, Эдвард Вайводзіш, Лявон Квест, Дамінік Мяжэцкі, Баляслаў Сітнік, Антон Ворсаў, Станіслаў Красневіч, Рыгор Плыгаўка. Тым часам спіс № 19 складаўся з 10 кандыдатаў: К. Езавітаў, М. Дзямідаў, С. Сахараў, Мікалай Савіцкі, Язэп Пятроўскі, Антон Ворсаў, Аўгуст Дварэцкі, Уладзімір Васілёнак, Дамінік Мяжэцкі, Міхал Байкоўскі. *Выбары ў Дзьвінскую Думу,* "Голас беларуса", 1925, № 9, с. 3; LVVA, 3009 f., 1 apr., 3 l., 41 lp.

[371] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 80, л. 7.

планавала выставіць беларускі спіс у Рызе (К. Езавітаў, С. Сахараў, А. Булат, М. Дзямідаў, Р. Плыгаўка, М. Байкоўскі, Д. Мяжэцкі), але адмовілася ад гэтай задумы[372]. 15 жніўня 1925 г. спісы беларускіх кандыдатаў былі перададзеныя ў дзяржаўную выбарчую камісію. Кіраўніцтва ТБВ лічыла немэтазгодным уносіць сваіх кандыдатаў у спісы рускай меншасці, як было падчас папярэдніх парламенцкіх выбараў. З гэтай прычыны сябрам таварыства А. Хруцкаму і С. Сахараву было забаронена браць удзел у мясцовых выбарах у якасці кандыдатаў рускага спіса[373].

Таварыства шукала саюзнікаў сярод прадстаўнікоў левай часткі латвійскага палітычнага спектра. Галоўная ўправа ТБВ даручыла К. Езавітаву падрыхтаваць палітычнае пагадненне з латвійскімі сацыял-дэмакратамі[374]. 8 жніўня 1925 г. прадстаўнік ЛСДРП Рудзевіч падчас перамоваў з К. Езавітавым паведаміў, што ЦК яго партыі не выказвае засцярог да супрацоўніцтва падчас перадвыбарчай кампаніі. Сацыял-дэмакраты згадзіліся, каб сябра ЛСДРП М. Дзямідаў і іншыя партыйцы выступалі ў складзе беларускага спісу. У сувязі з гэтым К. Езавітаў раіў Даўгаўпілскаму аддзелу ТБВ уключыць у беларускі спіс рабочых-беларусаў, сацыял-дэмакратаў, якія не трапілі ў выбарчыя спісы ЛСДРП[375].

Перавыбарчая агітацыя патрабавала значных выдаткаў, і незаможны беларускі актыў чарговы раз сутыкнуўся з праблемай нястачы сродкаў. Сведчаць пра гэта радкі з ліста (5 жніўня 1925 г.) С. Сахарава К. Езавітаву: "*Пачынаецца прадвыбарчая праца, а грошай няма. Патрэбна знайсці не менш як 25–30 тыс. руб. На наша вучыцельства разлічваць нельга: яно зусім індыферэнтнае, апроч некалькіх асоб. Нават спектакля і таго зрабіць не могуць. Ці не дапаможа нам Амерыка? Бо выбары ў Сойм наша агульная стаўка. І тут трэба праявіць максімум энергіі*"[376]. У адказ лідар ТБВ прызнаваў, што справа сапраўды складаная, але разлічваў на дапамогу заакіянскіх сяброў. Больш за тое, лідар латвійскіх беларусаў быў гатовы аддаць на выбарчыя патрэбы кампенсацыю, якая належала яму за знаходжанне ў вязніцы падчас беларускага працэсу[377]. Сведчаннем нястачы сродкаў на перадвыбарчую

---

[372] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 81, л. 1.

[373] LVVA, 3009 f., 1 apr., 31 lp., Пратакол пасяджэння Часовай цэнтральнай управы Таварыства беларусаў -выбаршчыкаў у Дзяржаўны Сойм, гарадскія, павятовыя і валасныя самаўрады ў Латвіі, 21 VII 1925; НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 80, л. 13.

[374] LVVA, 3009 f., 1 apr., 31 lp., Пратакол паседжання Часовай цэнтральнай управы Таварыства беларусаў -выбаршчыкаў у Дзяржаўны Сойм, гарадскія, павятовыя і валасныя самаўрады ў Латвіі, 21 VII 1925; НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 80, л. 13.

[375] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 80, л. 16.

[376] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 35, л. 3.

[377] У лісце К. Езавітава (10 жніўня 1925 г.) чытаем: "*З грашовымі выдаткамі пакуль-што цяжкавата, але ёсць пэўнасьць што на гэтых днях мне надышлюць дапамогу-пазыку, апрача*

кампанію з'яўляюцца пазнейшыя дэкларацыі старшыні таварыства: пасля выбараў засталіся пазыкі, якія належала сплаціць[378].

Нягледзячы на матэрыяльныя цяжкасці, беларускі актыў усё ж распачаў перавыбарчую кампанію. Агітацыя вялася шляхам выдання ўлётак, а таксама на старонках тыднёвіка "Голас беларуса". Пры гэтым большасць перавыбарчых матэрыялаў друкавалася на рускай мове[379]. Праграма ТБВ была надрукавана ў некаторых заходнебеларускіх выданнях[380]. Ведаючы палітычную пасіўнасць сялянскіх масаў, дзеячы ТБВ агітавалі не толькі галасаваць за сваіх кандыдатаў, але і ўвогуле ўдзельнічаць у выбарах. Агітацыя бывала нават вершаванай. Напрыклад, верш Віктара Вальтара "Покліч сялянскага сына", аўтар якога заклікаў не стаяць убаку ад выбарчай актыўнасці[381]. На старонках "Голасу беларуса" змяшчалася падрабязная інструкцыя наконт працэдуры галасавання[382]. Што тычыцца ўлётак, дык першая іх партыя накладам 250 асобнікаў была надрукаваная ўжо ў жніўні 1925 г. у тыпаграфіі Левіна. Кастусь Езавітаў раіў адразу расклеіць у Даўгаўпілсе 100–150 штук, а потым штодня даклейваць "бо напэўна расейцы і палякі будуць зрываць іх"[383]. На патрэбы перавыбарчай агітацыі спіс № 30 надрукаваў 1 тыс. асобнікаў адозвы да выбаршчыкаў на тэрыторыі Лудзенскага павета – у Рунданскай і Пылдзенскай воласцях было распаўсюджана 370, у Міхайлаўскай – 200, у Янавольскай – па 100. Найцяжэй было даставіць улёткі ў Істэрскую і Ланцкаронскую воласці, кепска скамунікаваныя з Лудзай. Сяргей Казека прапанаваў К. Езавітаву раздаваць выбарчую адозву падчас кірмашу ў Лудзы напярэдадні выбараў – 1 кастрычніка[384].

Беларускія кандыдаты ладзілі перадвыбарчыя мітынгі[385]. Ва ўмовах, калі значная частка сялянства была непісьменнай, сустрэчы з выбаршчыкамі

таго, хутка павінна развязацца справа і аб аплаце часу майго сядзення, бо закон на маім баку". НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 80, л. 19.

[378] *2-гі Зьезд дэлегатаў "Т-ва беларусаў-выбаршчыкаў у Латвіі"*, "Голас беларуса" 1926, № 21 ад 6 кастрычніка, с. 1–2.

[379] *Чего должны добиваться крестьяне и рабочие в Латвийском Государственном Сейме*, "Голас беларуса"1925, № 13 ад 19 верасня, с. 1; НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 38, л. 27.

[380] *Праграма Т-ва Беларусаў-Выбаршчыкаў у латвійскі сойм і самаўрады*, "Жыцьцё беларуса" 1925, № 6 ад 5 верасьня, с. 4.

[381] *Да ўрнаў!*, "Голас беларуса" 1925, № 14 ад 25 верасня, с. 2.

[382] *Сяляне, беззямельныя і малаземельныя, рабочые і працоўная інтэлігенцыя, 3 і 4 кастрычніка ўсе галасуйце ў Латгаліі за свой сьпісак № 30*, "Голас беларуса" 1925, № 14, с. 1; *Да ўрнаў!*, "Голас беларуса" 1925, № 14, с. 4.

[383] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 80, л. 30.

[384] НАРБ. ф. 458, воп. 1, спр. 51, л. 31.

[385] *Беларускі мітынг у Посіне*, "Голас беларуса" 1925, № 13 ад 19 верасня, с. 4; *Беларускі прэдвыбарчы сход у Дзьвінску*, "Голас беларуса" 1925, № 14 ад 25 верасня, с. 4; *Беларускі перадвыбарчы сход у Тартаку*, "Голас беларуса" 1925, № 15, с. 2; *Беларускі сход у Коплаве*, "Голас

былі самым надзейным спосабам палітычнай агітацыі. Гэта добра ведалі мясцовыя беларускія актывісты, пра што сведчыць ліст сябра Пустынскай валасной управы А. Мірановіча К. Езавітаву: "*6/IX, у нашую Пустыню, было заглянуўшы цэлых пяць агітатараў. Быў ад № 1 – адзін, хваліў свайго кс. Трасуна – праваліў. Далей ад № 2, было цэлыя два 'рыбакі', тыя яшчэ туды-сюды. Далей ад № 3, але той наехаў з сваёй літаратурай і сам з носам, і на канец ад № 25, але таму прышлось пабрыцца, лепі ад усіх, досыць таго, што яго добра крытыкавалі чуць не ўсе, апроч некалькіх яго нелятаў, якія маўчалі, дагаварыўшыся да таго, што трэба хлусіць (махляваць), каб папасці ў Сейм. 'Jeżeli nie skłamiesz to i nie popadniesz', па гэтых словах усе жыхары рассмяяліся да ўпаду і прышлось яму канчаць. Так што з усіх гэтых агітатараў на жыхарах не было зроблена ніякага вражэння, а тым больш, што пагода была дрэнная і люднасці было сусім гарстка. Пав. К. Барысавіч! Трэба раз'язжаць абавязкова; гэта мае бальшое значэнне ў нас напр.: жыхары цэлы час пытаюцца 'а калі ж будзе наш агітатар, трэба было яго паслухаць', а таму трэба абавязкова свае куткі каму-небудзь аб'ехаць хоць па разу. Толькі патрэбна зарання падрухаваць праграмы і адозвы да жыхарства*"[386].

Беларускія агітатары завіталі ў Пустынскую, Прыдруйскую, Вялікаіндрыцкую і Ізабэлінскую воласці. Зручнай нагодай для вулічнай агітацыі былі кірмашы, на якіх выступалі агітатары. 13 верасня 1925 г. у будынку Даўгаўпілскай беларускай гімназіі адбыўся перавыбарчы сход ТБВ[387]. Праца вялася таксама на Ілукшчыне. 26 верасня 1925 г. у Саліенскай воласці пад адкрытым небам адбыўся сход з удзелам кандыдатаў спіса № 19. На наступны дзень кандыдаты сустрэліся з выбаршчыкамі ў Борненскай воласці. Гэтага ж дня ў маёнтку Альмборн гэтай жа воласці адбыўся канцэрт-баль, які зладзіла ТБВ. Праграма мерапрыемства выглядала наступным чынам: пастаноўка спектакляў *У кавалёвай хаце* і *Збянтэжаны Саўка*; выкананне п'ес *Паклаўшы на Бога надзею* і *Дзіўныя вочы*; дэкламацыя вершаў вучняў беларускай гімназіі (Надзея Мікалаева, Францішка Навіцкая, Вікторыя Доўгая); танцы да 3 гадзіны раніцы[388]. Вядома, што сустрэча з выбаршчыкамі плануецца таксама ў Лудзы (27 верасня). Кандыдаты К. Езавітаў і С. Сахараў са згоды мясцовага святара павінны былі сустрэцца з выбаршчыкамі[389]. Аднак адсутнічаюць звесткі, што гэты сход адбыўся. Падчас перавыбарчай

беларуса" 1925, № 15, с. 2; *Беларусы на кірмашу ў Пустыні*, "Голас беларуса" 1925, № 15, с. 3; *Беларускі сход у Люцыне*, "Голас беларуса"1925, № 15, с. 3; *Беларусы на кірмашу ў Бароўцы*, "Голас беларуса" 1925, № 15, с. 3; НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 32, л. 22–24.

[386] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 33, л. 31–32.

[387] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 82, л. 6.

[388] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 82, л. 1–5.

[389] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 51, л. 32.

кампаніі не абышлося без інцыдэнтаў. Падчас вобшуку ў кватэры сябра ТБВ жыхара Індры М. Філіповіча паліцыя знайшла камуністычную літаратуру[390]. Прайшоў таксама пратрус у кватэры Д. Клагіша, старшыні філіяла таварыства ў Пустыне[391]. Беларускія крыніцы даносілі, што ў верасні 1925 г. у Пустыні валасны пісар сарваў беларускі выбарчы плакат, які на будынку валасной управы павесіў сябра ТБВ В. Клагіш[392].

Асноўныя пастулаты перадвыбарчай агітацыі кандыдатаў з беларускага спіса былі наступныя: 1) змаганне з беспрацоўем у гарадах (адбудова прамысловасці, развіццё замежнага гандлю з СССР); у гаротным становішчы прамысловасці абвінавачвалася буржуазія, якая, нібыта, баючыся росту рабочага руху не жадала адраджаць фабрыкі ў вялікіх гарадах, а замест гэтага імкнулася расцярушыць рабочых па вёсках і лясах; 2) перагляд аграрнай рэформы на карысць найбяднейшых; 3) скарачэнне выдаткаў на войска і ваенна-марскі флот; 4) барацьба з бюракратыяй у дзяржаўных установах; 5) зніжэнне падаткаў і збораў; 6) забеспячэнне правоў рабочых на фабрыках і заводах праз стварэнне больш эфектыўнай сістэмы страховак і адпачынкаў; 7) забеспячэнне рабочым грамадзянскіх свабод; 8) спыненне асіміляцыі нацыянальных меншасцей і абарона іх школ з роднай мовай навучання[393].

Больш дэталёва ўявіць лозунгі кандыдатаў беларускага спіса дазваляе рускамоўная брашура *Чего должны добиваться крестьяне и рабочие в Сейме?*. Аўтары звярталі ўвагу на цяжкае эканамічнае становішча краіны (застой фабрык і заводаў, рост беспрацоўя), хібы сацыяльнай палітыкі (несправядлівыя заробкі), празмерны бюракратызм, рэпрэсіі супраць іншадумства. Асобны параграф тычыўся становішча нацыянальных меншасцей (дыскрымінацыя ў дзяржаўных установах і банках, закрыццё школ, імкненне асіміляваць насельніцтва памежных з БССР рэгіёнаў). Прычына бядот грамадства бачылася ў тым, што краінай кіруе буржуазія, якая не разумее патрэб працоўных. Яскрава сведчыць пра гэта адзін з галоўных заклікаў брашуры: "*Твердо помните, что буржуазия врет! (...) Буржуазные списки и списки других меншинств хотят отвлеч Ваше внимание от земли и безработицы, разжечь Ваши страсти по вопросам религиозных и национальных и таким образом заставить Вас забыть о своих рабоче-крестьянских интересах*"[394].

---

[390] *Беларускае жыццё*, "Голас беларуса" 1925, № 2 ад 20 чэрвеня, с. 4.

[391] *Вобыскі ў беларусаў*, "Голас беларуса", 1925, № 9 ад 18 жніўня, с. 3.

[392] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 38, л. 22.

[393] *Чего должны добиваться крестьяне и рабочие в Латвийском Государственном Сейме*, "Голас беларуса" 1925, № 13 ад 19 верасня, с. 1.

[394] *О чем кричат буржуазные списки и списки других национальных меншинств?*, "Голас беларуса" 1925, № 13 ад 19 верасня, с. 2; НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 82, л. 14 зв.

Аналіз зместу агітацыйнай літаратуры паказвае, што яе аўтары засяроджваліся на сацыяльна-эканамічных пытаннях. Пры гэтым беларускія кандыдаты разлічвалі ў першую чаргу на галасы жыхароў вёскі. Справам горада ў перадвыбарчай літаратуры надавалася менш увагі за зямельныя справы. Пра становішча рабочых дзеячы беларускага спіса выказваліся даволі сціпла: "*Што датычыцца работніцкае справы, дык дамаганні не выходзяць па-за межы 46-гадзіннага тыдня працы і ўнармавання варункаў працы ў духу дамаганняў работнікаў Заходняе Еўропы*"[395]. Вырашэнне рабочага пытання бачылася ў звязку з сялянскім. На старонках газеты "Голас беларуса" сцвярджалася, што малазямельныя і беззямельныя сяляне, якія не ў стане пратрымацца ў вёсцы, без ваганняў пераедуць у горад і знойдуць працу на фабрыках і заводах, як гэта адбывалася да І сусветнай вайны. Аднак адсутнасць фабрык і заводаў у гарадах пазбаўляе іх такой магчымасці[396]. Тым часам нацыянальныя і культурныя пытанні знаходзіліся пры самым канцы выбарчай праграмы. Аўтары ўлёткі "Все трудящиеся голосуют за объединенный крестьянско-рабочий список, который идет в Латгалии под № 30 и Земгалии под № 19" паўтаралі, што падтрымліваюць незалежную латвійскую дзяржаву ў форме дэмакратычнай рэспублікі ў існых межах з роўнымі правамі для ўсіх грамадзян і нацыянальна-культурнай аўтаноміяй для ўсіх меншасцей[397].

Аналіз перадвыбарчых пастулатаў беларускага спіса наводзіць на думку, што кандыдаты мусілі браць пад увагу стаўленне савецкага боку, які часткова фінансаваў працу ТБВ. 24 жніўня 1925 г. на нарадзе па замежных справах ЦК КП(б)Б было вырашана выдаткаваць арганізацыі сродкі на перадвыбарчую кампанію ў латвійскі Сойм. Тады ж было вырашана скіраваць у Латвію прадстаўніка дзеля партыйнай працы ў беларускіх раёнах[398]. Менскія камуністы разлічвалі ахапіць сваім кантролем выбарчыя камітэты, створаныя К. Езавітавым, і звязаць іх з Кампартыяй Латвіі, каб праз іх уплываць на настроі беларусаў Латгаліі, выбраўшы з іх складу "*лучших честных элементов*" і стварыць з іх адданы СССР актыў, які нейтралізуе і знішчыць "*роль и значение авантюристичной по существу эмиграции*"[399]. У выпадку правядзення ў Сойм Латвіі дэпутатаў-беларусаў разглядалася магчымасць арганізаваць іх у асобную фракцыю па прынцыпе Беларускай сялянска-работніцкай

---

[395] *Праграма Т-ва Беларусаў-Выбаршчыкаў у латвійскі сойм і самаўрады*, "Жыцьцё беларуса" 1925, № 6 ад 5 верасьня, с. 4.

[396] *Чаму наша вёска такая бедная*, "Голас беларуса" 1925, № 12 ад 8 верасня, с. 1.

[397] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 82, л. 36.

[398] *Знешняя палітыка Беларусі. Зборнік дакументаў і матэрыялаў. Т. 2. 1923–1927*, рэд. У. Міхнюк і інш., Менск 1999, с. 171.

[399] *Знешняя палітыка Беларусі. Зборнік дакументаў і матэрыялаў. Т. 2. 1923–1927*, рэд. У. Міхнюк і інш., Менск 1999, с. 188.

грамады ў польскім парламенце[400]. Аднак савецкія куратары К. Езавітава не былі задаволеныя ходам беларускай кампаніі. Яны скептычна ацэньвалі змест улётак і адозваў беларускага спіса. Ананімны савецкі агент скардзіўся ўпаўнаважанаму НКЗС СССР у Рызе, што перадвыбарчая літаратура спіса выглядала непераканаўчай, бо складалася без удзелу савецкіх прадстаўнікоў і адлюстроўвала "*ўнутраны змест Езавітаўскай групы: мяккацелыя, баязлівыя інтэлігенцікі, якія жадаюць граць палітычную ролю ў пальчатках*". Савецкі бок патрабаваў ад К. Езавітава і яго паплечнікаў радыкальнейшых крокаў і выказванняў, на што апошні пагаджаўся з вялікім нежаданнем[401].

Беларускім кандыдатам у 1925 г. супрацьстаялі тыя ж сапернікі, што і два гады таму. Гэта былі дзеячы агульналатышскіх, латгальскіх, рускіх і польскіх партый і рухаў. Падчас перадвыбарчай кампаніі адбывалася вострая барацьба, якая суправаджалася крытыкай канкурэнтаў. Дзеячы ТБВ заклікалі выбаршчыкаў галасаваць толькі за беларускі спіс, падкрэсліваючы, што чужыя кандыдаты не змогуць эфектыўна бараніць правы беларусаў у парламенце[402]. На старонках беларускай прэсы і агітацыйнай літаратуры гучаў заклік: "*Сяляне, малазямельныя і беззямельныя і рабочыя! Цвёрда памятайце свае працоўныя інтарэсы, ні ў якім выпадку не падавайце сваіх галасоў за польска-абшарніцкія і руска-буржуазныя спісы. Усе, як адзін, агітуйце і галасуйце за свой аб'яднаны рабоча-сялянскі спіс*"[403]. Прадстаўнікі іншых выбарчых спісаў таксама не марнавалі часу. Беларускі спіс атакавалі некаторыя латвійскія і латгальскія групы. Ужо пасля выбараў газеце "Latvis" з'явіўся артыкул пра тое, што ў беларускім спісе былі кандыдаты з латышскімі прозвішчамі. У адказ з'явіўся адкрыты ліст абураных кандыдатаў спісу № 30 М. Клагіша і Э. Вайводзіша. Першы ў звароце да галоўнага рэдактара латвійскай газеты пісаў: "*Я, Клагіш, не лічу сябе латышом таму, што ні я, ні мае продкі, ніколі не гутарылі па-лытышску; хатняй жа мовай заўсёды з'яўляецца беларуская. Думка карэспандэнта, данага артыкула, з'яўляецца памылковай, таму, што збеларусіць маіх продкаў некаму была і дзеля таго, што ганенне на беларусаў, вялося ўжо з даўніх часоў. Прозвішча 'Клагіш' – пытанне яшчэ дужа супярэчлівае, ці – паходзіць яно ад карэнняў латыскіх слоў, альбо беларускіх. Што датычыцца прозвішчаў наогул, то гэта – не залежыць ад нацыянальнасці, так напрыклад: Іваноў, Юрашэўскі, Пантэвіч,*

---

[400] *Знешняя палітыка Беларусі. Зборнік дакументаў і матэрыялаў. Т. 2. 1923–1927*, рэд. У. Міхнюк і інш., Менск 1999, с. 188.

[401] Д.А. Короткова, *Поиски союзника. Контакты советских дипломатов в Латвии с К.Б. Езовитовым в 1925–1926 гг.*, "Славянский мир в третьем тысячелетии" 2020, Том 15, № 1–2, с. 52.

[402] *Беларусы рыхтуймося да выбараў у Сойм*, "Голас беларуса", 1925, № 9 ад 18 жніўня, с. 3.

[403] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 82, л. 15–16.

Зінкевіч, Міровіч і г.д., якія з'яўляюцца лытышамі, а іх прозвішчы красамоўна кажуць аб іх славянскім паходжанні. Акрамя таго, у Пустынскай гміне, захаваліся дакументы, з якіх відаць, што наш дзед і продкі паходзілі з беларусаў"[404]. У падобным духу выказваўся Э. Вайводзіш: "*ні я, ні наогул Вайводзішы сябе латышамі не лічаць, а былі і ёсць беларусамі (...) як у мяне, гэтак і ў іншых Вайводзішаў родная мова ёсць мова беларуская, і наколькі мне вядома, мае продкі ніколі не гаварылі па-латышску*"[405].

Выбары ў Сойм II склікання (1925/1928) адбыліся 3 і 4 кастрычніка 1925 г. Беларускія кандыдаты мусілі змагацца за месцы ў парламенце ва ўмовах значнай канкурэнцыі. У выбарчай гульні ўдзельнічаў ажно 141 спіс. Сярод іх належыць узгадаць шэраг спісаў латгальскіх дзеячоў правай плыні: № 1 – Латгальская дэмакратычная партыя (Франціс Трасунс, *Francis Trasuns*), № 4 – Латгальская працоўная партыя, № 7 – Латгальская працоўная народная група (на гэтым спісе ішоў непрыхільны беларусам Франціс Кэмпс) і № 9 – Партыя хрысціянскіх аратых і каталікоў (япіскап Язэпс Ранцанс, *Jāzeps Rancāns*)[406]. Кандыдаты некаторых з гэтых спісаў абяцалі падтрымку моўнай аўтаноміі нацменаў. У праграме спіса № 4 чытаем: "*Всех русских, поляков, белоруссов и прочих мы считаем полноправными гражданами свободной Латвийской республики и обязуемся отстаивать их все нужды, поскольку это будет согласовано с интересами трудового крестьянства. Только ту сепаратную политику, которую ведут отдельные меншинственные реакционные группы, мы категорически отвергаем и будем выступать против нея в интересах демократии всего нашего государства*"[407]. Рускамоўнае выданне спіса № 4 заклікала латгальскіх сялян не галасаваць за беларускі спіс, які, паводле іх, выставілі сацыял-дэмакраты, каб прывабіць выбаршчыкаў[408].

У сваю чаргу спіс № 7 не згадваў пра беларусаў, але ў рускамоўнай улётцы звяртаўся да "рускіх сялян", бо "*інтарэсы латгальскага сяляніна, каталіка, праваслаўнага і стараабрадца, цалкам аднольнавыя. Гэтыя інтарэсы лепш абароніць латгалец, чым рускі абшарнік ці адвакат з Рыгі ад рускіх*"[409]. Акрамя таго, за галасы беларускамоўных сялян Латгаліі змагаліся левыя латвійскія партыі, якія пайшлі на латгальскую вёску стварыўшы спіс № 2 – Саюз аратых Латгаліі (*Latgales zemes araju Savieniba*). Групоўка выдавала ў Даўгаўпілсе газету "Голос малоземельных", а таксама ўлёткі па-руску. Сацыял-дэмакраты таксама не выпускалі з-пад увагі славянамоўнае насельніцтва Латгаліі.

---

[404] *Адгукі на стацьцю 'Latvis'a'*, "Голас беларуса" 1926, № 18 ад 25 жніўня, с. 2.

[405] Тамсама.

[406] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 86, л. 7.

[407] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 85, л. 40.

[408] *За кого не следует голосовать*, "Трудовик", 1925, № 4 от 20 сентября, с. 3.

[409] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 85, л. 100.

У праграме ЛСДРП (спіс № 3 на чале з Янісам Райнісам) быў пункт пра падтрымку нацыянальна-культурнай аўтаноміі для нацменаў. Сацыял-дэмакраты абяцалі прыраўняць рускую мову ў Латгаліі да дзяржаўнай як мову зразумелую і іншым нацменам. Наогул сацыял-дэмакраты пазіцыянавалі сябе як абаронцы нацменаў і іх правоў, пераконваючы, што сапраўдную нацыянальна-культурную аўтаномію яны атрымаюць толькі тады, калі ў парламенце будуць моцныя ўплывы сацыял-дэмакратаў[410].

Канкурэнцыю беларускаму спісу складалі і два спісы рускай меншасці: № 6 – Праваслаўныя выбаршчыкі і рускі блок (архіепіскап Іаан) і № 14 – Рускі спіс валасных і грамадскіх дзеячаў (А. Багачоў). Дзеячы з апошняга памяркоўна ставіліся да беларусаў, дапускаючы раўнапраўе моваў мясцовых нацыянальных меншасцей у судах і іншых грамадскіх месцах[411]. Тым часам у склад спіса № 6 уваходзілі дзеячы Рускага працоўнага саюза, якія наступным чынам акрэслівалі стаўленне да беларусаў: "*'Русский трудовой союз' исходит из того основного положения, что русское население едино. У него одна вера, один язык, одна национальность, одна культура и одна общая судьба. Он так сложился исторически. Религиозные оттенки (православные и старообрядцы) и национальные особенности (великороссы, малороссы и белороссы) не меняют принципа единства. Все это наносное, нездоровое, временное не должно иметь места в Латвии. Поэтому 'Русский трудовой союз' будет всемерно и упорно бороться со всякого рода попытками, напрывленными к разделению единого русского населения по релизиозному или иному признаку, с какой бы целью это разделение не проводилось*"[412]. Традыцыйным канкурэнтам беларусаў быў польскі спіс (№ 25) на чале з Ярославам Вільпшэўскім. Польскія дзеячы патрабавалі захавання польскай мовы ў каталіцкіх святынях, развіцця польскай школьнай справы, сацыяльна-эканамічных правоў. Адначасова яны працягвалі сцвярджаць, што ўлады намагаюцца "перарабляць палякаў у беларусаў"[413].

Вынік выбараў для беларускіх дзеячаў былі несуцяшальныя. Чарговы раз спроба правесці ў парламент беларускага прадстаўніка скончылася паразай. Ва ўсёй Латвіі за беларускі спіс было аддадзена толькі 1 900 галасоў[414]. У Земгаліі беларускі спіс атрымаў 4 942 талоны (166 галасоў), а ў Латгаліі – 39 376 (1 734 галасы)[415]. Найбольшую падтрымку спіс № 30 атрымаў у Прыдруйскай

---

[410] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 85, л. 1, 29, 31; *Социал-демократия и меньшинства*, "Труд" 1925, № 14 от 27 сентября, с. 1–2.

[411] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 85, л. 56.

[412] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 85, л. 55.

[413] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 85, л. 63.

[414] J. Różycki, *Polacy na Łotwie*, Warszawa 1930, s. 5.

[415] *Окончательный состав новаго Сейма*, "Сегодня" 1925, № 233 от 16 октября, с. 4.

воласці, дзе за яго прагаласавала 695 чал.[416] Аднак гэты эпізод можна лічыць адзіным поспехам беларускіх кандыдатаў на выбарах у Сойм II склікання. Найгоршыя вынікі беларусам прынесла галасаванне ў Даўгаўпілсе, дзе беларускі спіс падтрымалі толькі 97 выбаршчыкаў. Тым часам прадстаўнікі спіса "Праваслаўныя выбаршчыкі і рускі блок" тут атрымалі 639 галасоў, "Аб'яднаны спіс рускіх валасных і грамадскіх дзеячаў" – 335, польскі спіс – 3 063, кандыдаты ад стараверaў – 1 369, сацыял-дэмакраты – 3 920[417]. У агульным маштабе канкурэнты беларусаў (агульналатвійскія і латгальскія партыі, прадстаўнікі рускай і польскай меншасці) мелі значна лепшыя вынікі. Напрыклад, за польскі спіс прагаласавала 12 497 чал., у тым ліку 6 808 – у Латгаліі і 4 932 – у Земгаліі[418]. У Латгаліі найбольшую падтрымку мелі латгальскія дэмакраты Ф. Трасунса (2 дэпутаты), ЛСДРП (5 дэпутатаў), партыя епіскапа Язэпса Ранцанса (4 дэпутаты) і інш. Нядрэнны вынік паказалі рускія спісы і польскі, якія па Латгаліі правялі ў парламент адпаведна 4 і 1 дэпутатаў[419].

Выбарчая параза беларусаў чарговы раз дала нагоду нядобразычліўцам сцвярджаць, што беларуская меншасць у Латвіі гэта "штучная з'ява". Вось што пісала руская газета "Вечернее время": "*Конечно, белорусское население, которого статистическое бюро насчитывало до 70 тыс., оказались в 'разсеянии' сущие: они собрали до смешного мало голосов (970) и не могли провести даже одного депутата. Жизнь показала правильность тех, кто считал белоруссов в Латвии детищем г. Скуеника*"[420].

Самі беларусы бачылі некалькі прычын няўдачы. Сярод іх – агрэсіўная дзейнасць канкурэнтаў. Напрыклад, К. Езавітаў скардзіўся на латгальскія партыі, называючы іх перадвыбарчую кампанію "лоўляй меншасцёвых галасоў". Беларускі дзеяч даводзіў, што, трапіўшы ў Сойм дзякуючы нелатышскаму электарату, латгальскія дэпутаты праводзяць палітыку скіраваную супраць нацменаў ("латышызацыю і латгалізацыю меншасцёвых элементаў")[421]. Беларуская прэса крытыкавала метады перадвыбарчай агітацыі кандыдатаў рускіх спісаў[422]. На выбарах 1925 г. чарговы раз праявіліся слабыя арганізацыйныя і фінансавыя здольнасці мясцовага беларускага руху. У прыватнасці, польскія і рускія кандыдаты мелі вялікую перавагу над беларускамі, якая заключалася ў магчымасці весці перавыбарчую агітацыю з амбона. На думку кіраўнікоў беларускага руху, адмоўны ўплыў на вынік выбараў мела пазіцыя

---

[416] Дзеля параўнання за іншыя спісы на Прыдруйшчыне было аддадзена: за № 3 – 670 галасоў, № 9 – 632, № 25–521. *Вынікі выбараў у Прыдруйшчыне*, "Голас беларуса" 1925, № 15, с. 3.

[417] "Двинский голос" 1925, 8 октября, с. 1.

[418] J. Albin, *Polski ruch narodowy na Łotwie w latach 1919–1940*, Wrocław 1993, s. 71.

[419] *Окончательный состав новаго Сейма*, "Сегодня" 1925, № 233 от 16 октября, с. 4.

[420] *Состав нового Сейма*, "Вечернее время" 1925, № 467 от 3 октября, с. 2.

[421] К. Езавітаў, *Крызіс Латгальскіх партыяў*, "Голас беларуса" 1926, № 19 ад 1 верасня, с. 2.

[422] *Расейскі перадвыбарчы маскарад*, "Голас беларуса" 1925, № 8 ад 18 жніўня, с. 2.

праваслаўнага і каталіцкага духавенства. Першыя актыўна агітавалі за рускія спісы (асабліва спіс № 6 на чале з архіепіскапам Іаанам). Тым часам, ксяндзы-палякі не вагаліся агітаваць вернікаў за польскі спіс. Вось як гэту з'яву характарызаваў К. Езавітаў: "*Беларускія духоўнікі ў Латвіі, відаць, яшчэ не дайшлі да поўнае свядомасці таго, што бараніць беларускія сялянска-работніцкія інтарэсы беларусы павінны адзіным фронтам, цесна гуртуючыся адзін каля аднаго і не разбіваючыся паміж іншымі партыямі і нацыянальнасцямі. Да гэтага часу беларускія духаўнікі не ідуць з беларускімі арганізацыямі, а цягнуцца да груповак, яўна нам варожых. Гэту горкую праўду павінны мы зазначыць як ксяндзам, гэтак і нашым свяшчэннікам, якіх усё яшчэ трымаюць на ланцужку расейскія арганізацыі*"[423]. Сваімі ўражаннямі наконт ролі святароў падчас выбараў лідар латвійскіх беларусаў падзяліўся з амерыканскімі беларусамі Я. Варонкам і Я. Чарапуком у лісце ад 31 кастрычніка 1925 г.: "*У Латвійскі сойм прайсці мне не ўдалося. Дзякуючы таму, што кампанія пачалася пазнавата, мы правялі галасоў толькі на палову кандыдата. Дужа пашкодзілі нам нашы папы і ксяндзы, якія пайшлі па клерыкальных спісках і лаялі нас на беларускай жа мове. Зразумела, самі яны не прайшлі і нас правалілі. Ліха ведае што*"[424]. Беларускія аўтары пісалі пра выпадкі ціску з боку святароў, якія забаранялі вернікам, якія не галасавалі за польскі спіс, прыходзіць да споведзі[425]. Адзін з чытачоў газеты "Голас беларуса" наступным чынам узгадваў размову са старой жыхаркай Дзвіншчыны: "*За каго ж ты будзеш, бабулька, галасаваць? За ксяндзоў і за палякаў, роднанькая! Чаго ж так? Ты ж беларуска! Але – беларуска, але каталічка. А ксёндз казаў, каб усе галасавалі за свой польскі спісак. А я – старая, смерць стаіць за плячамі, баюся пана ксяндза аслухацца, ксяндзоўскія словы свята*"[426].

Даступныя крыніцы не дазваляюць пацвердзіць альбо аспрэчыць вышэйзгаданыя сцвярджэнні. Але няма сумневу, што малапісьменныя сяляне аддавалі перавагу таму, што гаварылася з амбону, а не на перавыбарчых мітынгах. Беручы пад увагу непрыхільнае стаўленне мясцовага кліру абодвух веравызнанняў да беларускай дзейнасці, можна меркаваць, што яго роля падчас выбараў не спрыяла беларускаму спісу. Так ці інакш, рэлігійны фактар уплываў на ўпадабанні кансерватыўнага сялянства і не быў на карысць беларускім кандыдатам. Тут варта звярнуць увагу на тое, што праграма беларускага

---

[423] *Беларусы на кірмашу ў Пустыні*, "Голас беларуса" 1925, № 15, с. 3; *Беларускі сход у Люцыне*, "Голас беларуса" 1925, № 15, с. 3.

[424] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 243 lp.

[425] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 180, л. 1; *Пісьмы і развагі чытачоу "Голаса Беларуса"*, "Голас беларуса" 1925, № 16 ад 30 кастрычніка, с. 4; Краслаўскі, *І сьмех, і грэх, і на плач зьбірае*, "Голас беларуса" 1926, № 5 ад 10 траўня, с. 1.

[426] *Пісьма і развагі чатачоу "Голаса Беларуса". Наша беларуская маласьвядомасьць*, "Голас беларуса" 1925, ;18 ад 20 лістапада, с. 4.

спіса характарызавалася "левізной", а гэта не магло прыцягнуць традыцыйна рэлігійную латгальскую вёску. Цікава, што падобнага меркавання трымаліся і савецкія дыпламаты ў Латвіі, якія сачылі за ходам перадвыбарчай кампаніі. У прыватнасці, А. Чарных лічыў адной з прычын паразы беларускага спіса тое, што значную частку беларускага насельніцтва складалі каталікі. Гэтым самым савецкі прадстаўнік ускосна прызнаваў, што левыя погляды беларускіх палітыкаў не знаходзілі разумення каталіцкага насельніцтва. Ён дадаваў, што лідары беларускага спіса не знайшлі супольнай мовы з левымі латвійскімі сіламі, і гэта дэзарыентавала выбаршчыкаў левых поглядаў, якія не ведалі, за каго лепш аддаць галасы[427].

Тым не менш канкурэнцыя з боку іншых груповак і стаўленне духавенства не была галоўнымі перашкодамі для беларускіх кандыдатаў. Значна большы адмоўны ўплыў зрабіла грамадзянская пасіўнасць беларускамоўных латгальскіх сялян і іх праблемы з нацыянальнай ідэнтычнасцю. Гэта добра ўсведамлялі лідары беларускага руху. Кастусь Езавітаў галоўную прычыну няўдачы бачыў у непісьменнасці, нізкай нацыянальнай і палітычнай свядомасці латгальскіх беларусаў. Ён звяртаў увагу на кепскую яўку і лічыў, што беларускае грамадства паставілася несур'ёзна да выбараў[428].

Незаможнае мясцовае сялянства, якое змагалася з наступствамі вайны і было занятае штодзённымі клопатамі, не разумела сутнасці беларускай нацыянальнай ідэі. Мясцовы беларускі рух рабіў толькі першыя крокі і быў невядомы пераважнай большасці сялянства. Тым часам, сацыяльна-эканамічныя лозунгі беларусаў былі шмат у чым падобныя да тых, якія прапаноўвалі агульналатвійскія партыі, але тыя мелі непараўнальна большы досвед і магчымасці для падрыхтоўкі і вядзення перавыбарчай кампаніі. Беларускія лідары мусілі пагадзіцца з сумнай праўдай і рабіць высновы на будучыню. Дамо яшчэ раз слова К. Езавітаву, які наступным чынам падсумаваў выбарчыя падзеі: "*Прычына гэтага* [паразы на выбарах – ЕГ] *ляжаць*

---

[427] Д.А. Короткова, *Поиски союзника. Контакты советских дипломатов в Латвии с К.Б. Езовитовым в 1925–1926 гг.*, "Славянский мир в третьем тысячелетии" 2020, Том 15, № 1–2, с. 50.

[428] Адраджэнец, *Чаму беларусы прайгралі выбарчую кампанію ў Латвіі*, "Голас беларуса" 1925, № 17, с. 2. LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l. Лідар латвійскіх беларусаў дакараў беларускамоўны электарат, які галасаваў за чужыя спісы: "*Маскалі-велікаросы і палякі таксама агледзіліся і ўбачылі, што далі маху, даверыўшы абарону сваіх інтарэсаў чужым па нацыянальнасьці людзям. Дык на выбарах у другі Латвійскі Сойм, што адбыліся ў мінулым 1925 годзе, маскалі і палякі ўжо галасавалі, у пераважнай сваёй большасці, за свае нацыянальныя спіскі і правялі шмат сваіх дэпутатаў. Удалося абдурыць толькі адных беларусаў. Толькі мы адны на выбарах у другі Латвійскі Сойм усё яшчэ верылі латгальскім партыям і толькі ў нас, беларусаў, знайшліся нават некалькі чалавек якія здуру пайшлі на абяцанкі, далі сваё імя на чужыя спіскі і як нацятыя агітавалі за гэтыя спіскі сярод беларускага сялянства*". К. Езавітаў, *Крызіс Латгальскіх партыяў*, "Голас беларуса" 1926, № 19 ад 1 верасня, с. 2.

не столькі звонку нас, як сколькі ў нас саміх. Найгалоўнешая прычына гэта наша непісьменнасць і малая нацыянальная свядомасць. А адсюль паходзе і малая наша арганізаванасць на нацыянальным грунце. Тое, што ў беларусаў у Латвіі ўсяго 23–30% граматных, не дае магчымасці беларускай газеце і літаратуры выйсці ў шырокія масы нашае меншасці. Перавыбарчая літаратура ішла на цыгаркі, а галасавалі за тых, хто больш здолеў нагаварыць прыемных рэчаў і хто не спыняўся перад тым, каб лаяць і мяшаць з гразёй іншых. Свядомасць жа нацыянальная настолькі ў беларусаў у Латвіі слаба, што шмат хто з беларусаў, нават некаторыя беларускія настаўнікі, ксяндзы і свяшчэннікі далі сваю згоду на выстаўленне іхных кандыдатур па іншых, не беларускіх, спісках, часта-густа вельмі варожых да беларускае меншасці. Брыдка было глядзець і слухаць, як на беларускай мове, беларускі жа ксёндз распінаўся за лытышскі спісак і лаяў свой спісак беларускі. Усе гэты ксяндзы, настаўнікі, свяшчэннікі і некаторыя выдатныя сяляне і рабочыя былі ўцягнуты ў варожыя беларусам спіскі спецыяльна дзеля таго, каб раскалоць беларусаў і адцягнуць частку беларускіх галасоў да розных небеларускіх спіскаў. Тым, каго заманьвалі і перацягвалі, абяцалі, што іх правядуць у Сойм, і легкадумныя грамадзяне-беларусы верылі гэтаму, прадаючы за ілжывыя абяцанкі свой народ і выступаючы супроць свайго спіска. Зразумела іх абманулі, скарысталі іхнюю перадвыбарчую працу, а мандата ў Сойм ім не далі. Нам шкада гэтых легкаверных. Аднак тое, што яны зрабілі сваёй легкадумнасцю і сваім эгаізмам, цяжка апраўдаць, а галоўнае няма магчымасці хутка паправіць. Але мы мусімо скарыстаць з гэтае навукі і мусімо паправіць сумныя вынікі нашае несвядомасці. Паправіць жа ўсё гэта мы зможамо толькі адзіным спосабам – арганізацыя ўсяго беларускага сялянства, рабочых і працоўнае інтэлігенцыі каля адзінага ў Латвіі беларускага палітычнага 'Т-ва Беларусаў-Выбаршчыкаў' і пасіленай працай над падняццем свае нацыянальнае і сацыяльна-клясовае свядомасці"[429].

Можна задумацца, ці на вынік галасавання мог паўплываць беларускі працэс? Беларускія дзеячы нярэдка спасылаліся на яго як на адну з прычын паразы на выбарах 1925 г. Даступныя крыніцы не дазваляюць адназначна гэта пацвердзіць. Выбары адбыліся праз некалькі месяцаў пасля заканчэння працэсу, выбаршчыкі відавочна памяталі гэту бясслаўную падзею. Яна ствараля нездаровую, неспрыяльную беларусам атмасферу ў Латгаліі. Складана, аднак, вызначыць наколькі сур'ёзна гэта акалічнасць магла зашкодзіць кандыдатам беларускага спіса. Так ці інакш, пасля выбараў 1925 г. беларускія дзеячы не мелі падстаў цешыцца. Увесну 1926 г. К. Езавітаў так каментаваў наступствы выбарчай паразы: "*Цяперака з беларусамі не хочуць лічыцца,*

[429] Адраджэнец, *Чаму беларусы прайгралі выбарчую кампанію ў Латвіі*, "Голас беларуса" 1925, № 17, с. 2.

беларускія школы зачыняюць, а на іх месца адчыняюць латышскія, беларускім сялянам зямлі не даюць, ды аддаюць зямлю розным лытышскім чыноўнікам, якія на ёй зусім і працаваць не хочуць. Схапіліся мы, ды позна! Былі б у Сойме беларусы дык, змаглі бы цяперака падтрымаць левых, а левыя партыі падтрымалі бы нас. А як у Сойме нашых няма, дык мы толькі і можамо глядзець збоку, як дэмакратыя змагаецца з буржуазіяй, а самі нічым дапамагчы ў гэтым змаганні не можамо. Вось вам і навука на будучыню, – папоў, ксяндзоў ды паноў слухайце, але свой сялянскі розум майце ды кіруйцеся сваімі сялянска-працоўнымі інтарэсамі"[430].

Своеасаблівай кампенсацыяй за паразу на парламенцкіх выбарах былі вынікі муніцыпальных. На з'ездзе ТБВ (2 жніўня 1925 г.) дэлегаты абралі 23 кандыдатаў у дэпутаты органаў самакіравання, з якіх 6 паходзіла з Рыгі, 7 – з Латгаліі і 10 з Земгаліі[431]. Перад выбарамі ў гарадскую думу Даўгаўпілса быў створаны беларускі спіс № 18, у які ўвайшлі: С. Сахараў, К. Александровіч, слесар Даўгаўпілскай электрычнай станцыі Браніслаў Доўгі, настаўнік Сцяпан Махноўскі і сталяр Васіль Капылоў[432]. У прынагодна выдадзенай улётцы ТБВ адзначалася, што беларусы, хоць і складаюць значную частку жыхароў горада, не маюць прадстаўніка ў гарадской думе. Аўтары заклікалі не ўхіляцца ад удзелу ў галасаванні і не галасаваць за кандыдатаў іншых спісаў. Праграма беларускага спісу ўтрымлівала наступныя пастулаты: 1) падтрымка гаспадарчых інтарэсаў дробных арандатараў гарадскіх зямельных надзелаў; 2) актыўная барацьба з беспрацоўем; 3) матэрыяльная дапамога найбяднейшым жыхарам шляхам арганізацыі грамадскіх прац, паляпшэнне ўмоў у дзіцячых прытулках, дамах састарэлых, дзіцячых садках, медычная дапамога насельніцтву; 4) абарона інтарэсаў працоўных, змаганне за 8-гадзінны працоўны дзень, паляпшэнне ўмоў аплаты працы, страхаванне працоўных, задавальненне іх культурна-асветных патрэб праз адкрыццё бібліятэк, вячэрніх агульнаадукацыйных і тэхнічных курсаў; 5) зніжэнне гарадскіх падаткаў і тарыфаў на ваду і электрычнасць; 6) абарона культурных інтарэсаў беларусаў, каб яны мела добра ўладкаваныя школы, а дзеці найбяднейшых – бясплатныя падручнікі, абутак і вопратку[433]. Па сутнасці праграма паўтарала асноўныя пастулаты праграмы беларускага спіса на парламенцкіх выбарах. Галоўны акцэнт рабіўся на сацыяльна-эканамічныя, а не нацыянальна-культурныя, справы з увагай да патрэб гараджанаў. У выніку ў 1925 г. у Даўгаўпілскую гарадскую думу трапілі два беларусы –

---

[430] Адраджэнец, *'Новы' урад у Латвіі*, "Голас беларуса" 1926, № 5 ад 10 траўня, с. 1.

[431] LVVA, 3009 f., 1 apr., 31 l., Пратакол I сходу дэлегатаў Таварыства беларусаў – выбаршчыкаў у Дзяржаўны Сойм, гарадскія, павятовыя і валасныя самаўрады ў Латвіі, 2 VIII 1925.

[432] *Выбары ў Дзьвінскую Думу*, "Голас беларуса", 1925, № 9 ад 18 жніўня, с. 3.

[433] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 91, л. 50.

С. Сахараў і А. Райко. Праўда, апошні балатаваўся як кандыдат латвійскіх сацыял-дэмакратаў[434].

Пасля паразы на парламенцкіх выбарах 1925 г. ТБВ не склала зброі і працягвала дзейнасць. У наступныя гады рэгулярна адбываліся пасяджэнні і сходы кіраўніцтва арганізацыі, абмяркоўваліся розныя справы, датычныя беларускай меншасці. Не маючы магчымасці рэалізацыі сваю праграму праз Сойм, дзеячы таварыства рабілі гэта, выкарыстоўваючы іншыя дазволеныя законам метады палітычнай барацьбы. У чэрвені 1926 г. кіраўніцтва ТБВ звярнулася да беларускай грамадскасці Латгаліі з заклікам збіраць сведчанні пра злоўжыванні чыноўнікаў – выпадкі няправільнага надання зямельных надзелаў падчас рэалізацыі пастаноў соймавай аграрнай камісіі. З падачы левых партый яна патрабавала перагляду зямельнай рэформы такім чынам, каб зямлю атрымалі малазямельныя і беззямельныя[435].

Кіраўніцтва ТБВ звярнула ўвагу на эміграцыю беларускіх сялян з Латгаліі за акіян: у Аргентыну, Бразілію і краіны Паўночнай Амерыкі. На пасяджэнні цэнтральнай управы 18 жніўня 1926 г. з ініцыятывы К. Езавітава было вырашана зацікавіць гэтым пытаннем беларускіх дзеячаў у ЗША і Канадзе. Управа палічыла мэтазгодным дэлегаваць сябра ТБВ Трафімовіча ў склад БНК у Чыкага ў якасці рэферэнта ў справах эміграцыі[436]. 21 жніўня 1926 г. кіраўніцтва таварыства вырашыла звярнуцца ў арганізацыйнае бюро Еўрапейскага кангрэса нацыянальных меншасцей у Жэневе з прапановай дэлегаваць да ўдзелу ў яго працы прадстаўніка латвійскіх беларусаў[437]. 19 верасня 1926 г. сход Рыжскага філіяла ТБВ прыняў падобнае рашэнне, прапануючы цэнтральнай управе дэлегаваць прадстаўніка латвійскіх беларусаў на 3-ю канферэнцыю нацыянальных меншасцей[438]. Кіраўніцтва арганізацыі разумела важнасць удзелу ў мерапрыемстве, гэта давала нацыянальным меншасцям магчымасць асвятлення з міжнароднай трыбуны сваіх спраў і праблем. Разам з тым дзеячы ТБВ скептычна ставіліся да фармату канферэнцыі. К. Езавітаў меркаваў, што беларусаў не можа задаволіць фармат культурна-моўнай аўтаноміі, які дэкларуюць арганізатары канферэнцыі. Дзеяч лічыў, што ён не адпавядае становішчу беларусаў – народа, якія кампактна пражывае на тэрыторыі іншых дзяржаў і складае большасць на значных абшарах гэтых краін. Кастусь Езавітаў сцвярджаў, што беларусы мусяць патрабаваць не

---

[434] *Агульны сход сяброў Дзьвінскага Аддзелу "Т-ва Беларусаў-Выбаршчыкаў"*, "Голас беларуса", 1926, № 37, с. 8.

[435] *Выратовывайце, беларусы, сваю зямельку!*, "Голас беларуса" 1926, № 7 ад 1 чэрвеня, с. 1.

[436] LVVA, 3009 f., 1 apr., 3 l., 85–86 lpp., Пратакол № 14 пасяджэння Цэнтральнай управы Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў, 17 VIII 1926.

[437] LVVA, 3009 f., 1 apr., 3 l., 90 lpp., Пратакол № 16 пасяджэння Цэнтральнай управы Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў, 3 IX 1926.

[438] *Беларускае жыццё у Латвіі*, "Голас беларуса" 1926, № 21 ад 6 кастрычніка, с. 4.

толькі культурна-моўнай, але і нацыянальна-тэрытарыяльнай аўтаноміі. Ён звяртаў увагу на тое, што арганізатары міжнародных канферэнцый не жадаюць уздымаць гэтае пытанне, што было прычынай адсутнасці на 2-й канферэнцыі дэлегатаў польскіх беларусаў, літоўцаў і ўкраінцаў, а таксама македонцаў з Каралеўства сербаў, харватаў і славенцаў. Беларускі дзеяч не спадзяваўся ад будучай канферэнцыі станоўчых для беларусаў вынікаў, але лічыць патрэбным адправіць беларускую дэлегацыю, бо гэты крок мог бы ўзмацніць пазіцыі латвійскіх беларусаў. Ён лічыў, што ТБВ як адзіная палітычная арганізацыя беларускай меншасці ў Латвіі мае права скіраваць на канферэнцыю дэлегатаў[439].

Таварыства рэагавала на грамадска-палітычныя падзеі ў Латвіі. Арганізацыя накіравала ў Латвійскае дзяржаўнае статыстычнае ўпраўленне дакладную запіску з патрабаваннем крытычна ацэньваць вынікі ўсеагульнага перапісу насельніцтва 1925 г., а менавіта колькасць беларусаў, бо той перапіс адбыўся ў вельмі нявыгадных грамадска-палітычных умовах[440]. 16 верасня 1926 г. цэнтральная ўправа ТБВ скіравала зварот кіраўніцтву БША з просьбай запатрабаваць ад дзяржаўных установ і Міністэрства асветы вылучыць беларускім школам сродкі ў адпаведнасці са звесткамі перапісу 1920 г., а не 1925 года, бо вынікі апошняга, лічыў беларускі бок, не адпавядаюць рэчаіснасці. Акрамя таго, таварыства заклікала кіраўніка БША да больш актыўнай абароны правоў беларусаў падчас пасяджэнняў Рады міністраў[441].

Таварыства звярнула на сябе ўвагу прадстаўнікоў рускай меншасці. Падчас пасяджэння ўправы Рускага нацыянальнага саюза ў Латвіі[442] (27 лістапада 1926 г.) намеснік старшыні гэтай арганізацыі М. Барданос азнаёміў удзельнікаў з беларускім нацыянальным рухам, асобна спыняючыся на дзейнасці ТБВ: "*В Латвии имеется организация под названием 'Товарищество избирателей-белоруссов', которая ведет систематическую кампанию против русского сознания белоруссов и 'относясь отрицательно к православию', поставила себе целью также борьбу за освобождение 'белорусских масс из-под ярма московского православия', которое считает руссифицирующим и 'империалистическим'*"[443].

---

[439] *2-гі Зьезд дэлегатаў "Т-ва беларусаў-выбаршчыкаў у Латвіі". Даклад аб удзеле беларускае меншасьці ў Агульна-эўрапейскіх канфэрэнцыях меншасьцяў*, "Голас беларуса" 1926, № 22 ад 13 кастрычніка, с. 2.

[440] LVVA, 2125 f., 5 apr., 75 l., 46–49 lpp.

[441] LVVA, 2125 f., 5 ap., 75 l., 45 lp.

[442] Рускі нацыянальны саюз ў Латвіі, які налічваў у сваіх шэрагах каля 100 сяброў, належыў да правай часткі рускай палітычнай сцэны і аб'ядноўваў пераважна прадстаўнікоў рыжскай інтэлігенцыі.

[443] *В Русском Национальном союзе*, "Сегодня вечером" 1926, № 269 от 29 ноября, с. 4.

Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў не мела ўласнага друкаванага органа. Аднак на практыцы ім быў "Голас беларуса". Хоць К. Езавітаў і падкрэсліваў, што перыёдык не мае дачынення да дзейнасці ТБВ, у рэальнасці ён абслугоўваў патрэбы гэтай арганізацыі[444].

Нягледзячы на палітычны характар, ТБВ надавала ўвагу і культурна-асветнай працы. Арганізацыя ладзіла дабрачынныя мерапрыемствы – напрыклад, 5 снежня 1927 г. у гарадскім клубе ў Даўгаўпілсе правяло вечарынубаль. Сабраныя грошы былі ахвяраваныя на карысць найбяднейшых вучняў Даўгаўпілскай беларускай гімназіі. Старшыня таварыства заклікаў беларускі актыў да дабрачыннай дзейнасці, сцвярджаючы, што сітуацыя беднай сялянскай моладзі выглядала б лепш, калі б усе беларускія таварыствы рабілі такія акцыі[445]. З ліста маладога беларуса А. Сальцэвіча В. Ластоўскаму вынікае, што арганізацыя планавала стварыць у Латвіі беларускую бібліятэку-чытальню з тысячным кнігазборам. Аднак планам не было наканавана здзейсніцца[446].

Прыярытэтам ТБВ заставалася палітычная дзейнасць. Пасля няўдалых спроб правесці прадстаўніка ў парламент кіраўніцтва арганізацыі намагалася выпрацаваць новую стратэгію працы, якая павінна была забяспечыць беларусам перамогу на наступных выбарах. Кіраўніцтва ТБВ лічыла ранейшую арганізацыйную працу сярод латвійскіх беларусаў недастаткова эфектыўнай. У якасці доказу падаваўся факт, што беларускія грамадска-культурныя арганізацыі не выйшлі са сваёй агітацыяй за межы настаўніцтва. Апошняе, гатуючыся ва ўласным соку, не мела трывалай сувязі з беларускімі масамі – сведчаннем быў слабы ўдзел настаўнікаў у перадвыбарчай кампаніі 1925 г. Некаторыя актывісты ТБВ лічылі, што прыярытэтнай справай павінна стаць прыцягненне ў арганізацыю прадстаўнікоў сялянства і рабочых. З гэтай мэтай належала яскравей падкрэсліць праграмныя пастулаты таварыства, каб сялянскія і рабочыя масы бачылі ў ім абаронцу сваіх інтарэсаў[447].

---

[444] *2-гі Зьезд дэлегатаў "Т-ва беларусаў-выбаршчыкаў у Латвіі"*, "Голас беларуса" 1926, № 39, с. 2.

[445] Дзяменскі, *Зьбірайце грошы на падтрымку вучняў*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1927, № 3(1), с. 28.

[446] А. Горны, *Алесь Сальцэвіч – невядомы дзеяч беларускай меншасці ў Латвіі ў міжваенны перыяд* [у:] *Гісторыя Беларусі ў XX стагоддзі. Памяці прафесара Івана Коўкеля*, рэд. А. Горны, Гродна 2017, с. 212.

[447] Адзін з аўтараў на старонках "Голасу беларуса" пісаў: "*Галоўнейшая надзея перадвыбарчае агітацыі – беларускія вучыцялі, можна сказаць, у пераважнай большасці, не праявілі ніякае актыўнасці. З боку гледзячы выглядала так, што нібыта справа выбараў у Сойм зусім іх не цікавіла і да іх не датыкалася. Яны сабе сядзелі ціха дома, пасіўна адносячыся да выбараў, надзеючыся зноў на кагосьці. Гэткія іхнія пасіўныя адносіны да выбараў, можа, й былі галоўнейшай прычынай правалу нашага спіска*". К. Сенкевіч, *Якія павінны быць галоўнейшыя задачы чарговага Зьезду Дэлегатаў 'Т-ва Беларусаў-Выбаршчыкаў у Латвіі"*, "Голас беларуса" 1926, № 14 ад 28 ліпеня, с. 1.

Важнай падзеяй, якая вызначыла працу таварыства на наступныя гады, стаў II з'езд дэлегатаў ТБВ, які адбыўся 26 верасня 1926 г. у Даўгаўпілсе. Падзея была аб'яднана са святкаваннем 5-й гадавіны беларускага нацыянальна-адраджэнскай працы ў Латвіі. На з'ездзе разглядалі наступныя пытанні: 1) становішча беларускай асветы ў Латвіі; 2) рэагаванне на антыбеларускія выступы ў латышскай, польскай і рускай прэсе; 3) стварэнне Хаўрусу беларускіх меншасцей у Польшчы, Літве і Латвіі. У дакладзе пра стан беларускай асветы ў Латвіі К. Езавітаў прапанаваў даручыць цэнтральнай управе таварыства разгляд справы пашырэння складу Рады БША. Дзеяч бачыў патрэбу ўзнаўлення беларускай гімназіі ў Лудзы і адкрыцця новых беларускіх школ, у тым ліку ў Рызе. Старшыня ТБВ звярнуў увагу на патрэбу супрацьдзейнічаць дзяржаўным чыноўнікам, якія імкнуліся да латышызацыі беларускіх вясковых школ[448]. К. Езавітаў прапаноўваў уключыць прадстаўніка ТБВ у склад Рады БША, бо арганізацыя не была прадстаўленая ў гэтым органе. Тое, што ў працы Рады БША не бралі ўдзелу прадстаўнікі ТБВ, дзівіла і старшыню Даўгаўпілскай управы ТБВ У. Раткіна. У выніку з'езд прыняў рэзалюцыю з патрабаваннем папоўніць Раду Беларускага школьнага аддзела сябрамі ўсіх беларускіх грамадскіх арганізацый[449].

Каб пакласці канец праявам антыбеларускай дзейнасці, з'езд дазволіў цэнтральнай управе прыцягваць нядобразычліўцаў да судовай адказнасці. Адпаведная рэзалюцыя была прынятая пасля аповеду К. Езавітава пра выпадкі "злоснай траўлі" беларускага руху з боку прадстаўнікоў рускай, польскай і латышскай супольнасці на старонках прэсы і выданняў. Удзельнікі падтрымалі таксама прапанову К. Езавітава стварыць Хаўрус беларускіх меншасцяў у Польшчы, Латвіі і Літве. Мэтай новай арганізацыі павінна было стаць інфармаванне міжнароднай супольнасці пра стан і патрэбы беларускай меншасці[450].

---

[448] *2-гі Зьезд дэлегатаў "Т-ва беларусаў-выбаршчыкаў у Латвіі". Даклад аб становішчы Беларускае асьветы ў Латвіі*, "Голас беларуса" 1926, № 21 ад 6 кастрычніка, с. 1.

[449] Дэлегаты прапанавалі падчас фарміравання складу Рады выкарыстаць наступны падзел месцаў: ад беларускага настаўніцтва, згуртаванага вакол ТБНЛ – 3 прадстаўнікі з правам голасу, ад беларускіх грамадскіх арганізацый – 3 прадстаўнікі, дэлегаваныя БНКЛ. Да часу стварэння Беларускага нацыянальнага камітэта ў Латвіі падзел меўся выглядаць наступным чынам: 3 асобы – ад беларускага настаўніцтва (ТБНЛ), 1 – ад палітычных арганізацый (ТБВ), 1 – ад культурна-асветных таварыстваў ("Беларуская хата"), 1 – ад моладзі (таварыства "Рунь"), 3 (у тым ліку 1 з дарадчым правам голасу) – ад астаніх беларускіх арганізацый. LVVA, 3009 f., 1 apr., 31 l., 107 lp. Пратакол II сходу дэлегатаў Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў у Дзяржаўны Сойм, гарадскія, павятовыя і валасныя самаўрады ў Латвіі, 26 IX 1926; *2-гі Зьезд дэлегатаў "Т-ва беларусаў-выбаршчыкаў у Латвіі". Аб складзе Рады Беларускага Аддзелу пры Міністэрстве Асьветы ў Латвіі*, "Голас беларуса" 1926, № 23 ад 20 кастрычніка, с. 1.

[450] *2-гі Зьезд дэлегатаў "Т-ва беларусаў-выбаршчыкаў у Латвіі". Даклад аб стварэньню хаўрусу беларускіх меншасьцяў Латвіі, Літвы і Польшчы*, "Голас беларуса" 1926, № 22 ад 13 кастрычніка, с. 2.

Можна зрабіць выснову, што ТБВ мела амбіцыі ператварыцца ў галоўную арганізацыю беларускай меншасці ў Латвіі. Старшыня С. Езавітаў разглядаў таварыства як плацдарм для палітычнай дзейнасці, якой разлічваў ахапіць шырокія колы беларускага грамадства. Нязменным заставаўся палітычны курс арганізацыі. У прамове да дэлегатаў II з'езду К. Езавітаў адзначыў, што толькі сацыялістычная ідэалогія мае шанец прабіцца да сэрцаў беларускай меншасці. Ён рашуча асуджаў прадстаўнікоў беларускага руху, якія, на яго думку, імкнуліся цягнуць беларусаў Латвіі "ў бок буржуазіі". Дзеяч заклікаў цвёрда трымацца сацыялістычнага напрамку таварыства, якое мусіла адначасова бараніць нацыянальныя і сацыяльныя інтарэсы беларусаў Латвіі. Кастусь Езавітаў з надзеяй глядзеў на перспектывы развіцця ТБВ і лічыў першы год працы падрыхтоўчым часам, які заклаў падмурак пад нацыянальную і сацыяльную працу сярод беларускае меншасці. На яго думку, нягледзячы на кароткі час існавання арганізацыі ёй удалося адчыніць некалькі філіялаў, правесці з'езд дэлегатаў і пераможную кампанію падчас выбараў у органы мясцовага самакіравання[451].

На II з'ездзе была абраная новая цэнтральная ўправа ў складзе К. Езавітава (старшыня), У. Пігулеўскага, Н. Пінскай (сакратар), Р. Плыгаўкі (скарбнік) і П. Масальскага[452]. Акрамя таго, на прапанову У. Пігулеўскага быў створаны суд гонару ТБВ[453]. Дэлегаты ўхвалілі інструкцыю, якой належала кіравацца ў далейшай працы таварыства. Тычылася яна наступных спраў: 1) працы дзеля нацыянальнага ўсведамлення і самаарганізацыі беларускай меншасці; 2) культурна-асветнай працы; 3) працы ў органах самакіравання і мясцовых грамадскіх арганізацыях; 4) эканамічнай самаарганізацыі беларусаў; 5) паляпшэння фінансавага становішча арганізацыі. Рэалізаваць задачы планавалі шляхам арганізацыі групавых чытанняў і абмеркавання зместу беларускай прэсы; беларускіх спектакляў, вечарын, літаратурна-вакальных сустрэч; стварэння пры рэгіянальных філіялах ТБВ драматычных, краязнаўчых і спартовых гурткоў, хораў і аркестраў; пошуку новых сяброў. Падкрэслівалася патрэба кантактаваць з асобамі, якія раней не ўдзельнічалі ў грамадскім жыцці, а таксама "*абмаскаленымі або апалячанымі беларусамі*" з ліку сяброў рускіх і польскіх таварыстваў і школ. Акрамя таго, інструкцыя заклікала сяброў таварыства рэагаваць на антыбеларускія праявы ў іншанацыянальнай прэсе. Каб супрацьдзейнічаць нядобразычліўцам належала выкарыстоўваць уласную прэсу, мітынгі і размовы, а таксама ўдзельнічаць у працы органаў

---

[451] *2-гі Зьезд дэлегатаў "Т-ва беларусаў-выбаршчыкаў у Латвіі"*, "Голас беларуса" 1926, № 21 ад 6 кастрычніка, с. 1–2.

[452] LVVA, 3009 f., 1 apr., 3 l., 105 lp.; *2-гі Зьезд дэлегатаў "Т-ва беларусаў-выбаршчыкаў у Латвіі"*, "Голас беларуса" 1926, № 22 ад 13 кастрычніка, с. 1.

[453] *2-гі Зьезд дэлегатаў "Т-ва беларусаў-выбаршчыкаў у Латвіі". Аб Судзе Гонару пры 'Т-ве беларусаў-выбаршчыкаў у Латвіі'*, "Голас беларуса" 1926, № 23 ад 20 кастрычніка, с. 2.

самакіравання. Інструкцыя заклікала выхоўваць у сяброў таварыства пачуццё грамадскага абавязку і ўдасканальваць веды пра грамадзянскія правы ў Латвійскай Рэспубліцы, каб бараніць свае інтарэсы згодна з заканадаўствам. У галіне культурна-асветнай працы сябры арганізацыі павінны былі рупіцца ў месцах свайго жыхарства пра адпаведную колькасць беларускіх школ, дапамагаць бацькам адкрываць новыя адукацыйныя ўстановы і ўтрымліваць існуючыя. У інструкцыі звярталася ўвага на патрэбу пераконваць бацькоў аддаваць дзяцей менавіта ў беларускія школы. Таксама быў заклік ствараць аматарскія драматычныя гуркі, якія з часам можна было ператварыць у сталыя беларускія народныя тэатры[454].

Перад рэгіянальнымі філіяламі ТБВ ставілася задача ствараць у сваёй мясцовасці беларускі народны дом са сцэнай і бібліятэкай. Адзначалася, што ўправы рэгіянальных філіялаў таварыства мусілі заўсёды быць у курсе спраў мясцовых органаў самакіравання, пільна сачыць за працай мясцовай улады праз удзел у мітынгах і сходах. Асаблівая ўвага звярталася на неабходнасць выстаўляць беларускі спіс падчас выбараў у гарадскія думы і валасныя органы самакіравання. Складальнікі дакумента заклікалі сяброў арганізацыі ўдзельнічаць у добраахвотных пажарных таварыствах, прафсаюзах, кааператывах і г.д. Аўтары інструкцыі разумелі важнасць эканамічнай самаарганізацыі беларускай меншасці. У інструкцыі чытаем: "*Нацыянальнае адраджэнне не можа быць поўным, калі яно абмежавана толькі працаю культурна-прасветнаю і палітычна-грамадскаю. Ёсць яшчэ надзвычайна важная галіна жыцця – галіна эканамічная. Беларуская меншасць у Латвіі, пад уплывамі гістарычнага мінулага вельмі інертна ставілася і ставіцца да працы эканамічнае і зусім спакойна глядзіць на тое, што сярод беларускага жыхарства эканамічныя пазіцыі захопліваюцца прадстаўнікамі іншых нацый, якія часта-густа ў самы бясстыдны спосаб эксплуатуюць беларускае сялянства і працоўных. Каб пазбавіцца гэтага няправільнага з'явішча, мясцовыя аддзелы павінны прыняць усе меры да таго, каб падняць цікаваць беларускіх масаў да эканамічнай самадапамогі і працы*"[455].

На думку аўтараў інструкцыі, павялічыць эканамічную актыўнасць беларускай вёскі мусіла стварэнне пры рэгіянальных філіялах ТБВ кааператываў, пазыкова-ашчадных кас, малочных і жывёлагадоўчых суполак, суполак па гандлю яйкамі і г.д. З мэтай належнай падрыхтоўкі да перадвыбарчай кампаніі ў парламент і органы самакіравання ў 1928 г. ставілася мэта палепшыць матэрыяльнае становішча ТБВ. У дакуменце падкрэслівалася неабходнасць збіраць сяброўскія складкі і ахвяраванні, а таксама ладзіць вечарыны і латарэі.

---

[454] *Беларускае жыцьцё у Латвіі*, "Голас беларуса" 1926, № 25 ад 3 лістапада, с. 4.

[455] *2-гі Зьезд дэлегатаў "Т-ва беларусаў-выбаршчыкаў у Латвіі"*, "Голас беларуса" 1926, № 22 ад 13 кастрычніка, с. 1.

Мясцовыя ўправы таварыства мусілі дбаць пра распаўсюд сярод жыхароў беларускіх выданняў, продаж якіх таксама мог даваць прыбытак арганізацыі[456].

14 студзеня 1927 г. старшыня ТБВ падрыхтаваў даклад "Аб становішчы беларускай нацыянальнай меншасці ў Латвіі", адрасатам якога быў міністр-прэзідэнт Латвіі. У дакуменце было паказана, якую карысць можа прынесці беларусам і латвійскай дзяржаве палітыка падтрымкі беларускага руху. Падкрэслівалася, што ворагамі беларускага руху ў Латвіі выступаюць рускія і палякі, якія ў самаарганізацыі беларусаў бачаць аслабленне ўласных уплываў у Латгаліі і адток мясцовых праваслаўных і каталікоў ад рускіх і польскіх арганізацый. Аўтар лічыў, што ў гэтай сітуацыі адзіным хаўруснікам латвійскіх беларусаў можа быць латвійская дзяржава. Ён звяртаў увагу на падабенства гістарычных і нацыянальных лёсаў беларусаў і латышоў, якое стварала ідэальную глебу для сяброўства і супрацы. Дзеяч падкрэсліваў шкоднасць беларускага працэсу, ініцыяванага, на яго думку, "шавіністамі-чыноўнікамі". Ён лічыў неабходным унармаваць становішча беларусаў у Латвіі[457]. Задавальненне нацыянальна-грамадскіх патрэб беларускай меншасці аўтар бачыў у стварэнні "*спакойнай псіхалагічнай абстаноўкі для жыцця і працы: неабходна вярнуць ёй упэўненасць у заўтрашнім дні і па магчымасці нацыянальнай беларускай працы ў Латвіі. Дзеля гэтага неабходна зараз жа спыніць той паход супраць беларусаў, які ўсё яшчэ вядзецца асобнымі агентамі ўраду на месцах*"[458]. У эканамічнай сферы аўтар бачыў неабходнасць надзяліць зямлёй малазямельных незаможных беларускіх сялян праз парцэляцыю маёнткаў і выкарыстанне Зямельнага фонду. Таксама ён прапаноўваў стварыць магчымасць пазык з нізкімі працэнтамі для тых, хто найбольш пацярпеў ад вайны. Асобны тэматычны блок быў прысвечаны беларускай адукацыі. Па-першае, аўтар падкрэсліваў, што высяленні з памежнай паласы самых дзейных беларускіх настаўнікаў стварае нездаровую атмасферу. Па-другое, ён заклікаў дзяржаву паклапаціцца, каб беларускі рух пачаў дзейнасць на Ілукшчыне. Па-трэцяе, К. Езавітаў прасіў дазволу аднавіць беларускую гімназію ў Лудзенскім павеце – мясцовай беларускай моладзі пасля яе закрыцця пагражала русіфікацыя. Па-чацвёртае, беларускі дзеяч бачыў патрэбу стварыць у Рызе Латышска-беларускага таварыства ўзаемнага вывучэння[459].

Дзеячы ТБВ разлічвалі на добрыя вынікі парламенцкіх і мясцовых выбараў у 1928 г. Менавіта гэтай мэце былі падпарадкаваныя пастулаты вышэйзгаданай інструкцыі. Адным з галоўных пытанняў тычылася тактыкі перадвыбарчай

---

[456] *2-гі Зьезд дэлегатаў "Т-ва беларусаў-выбаршчыкаў у Латвіі"*, "Голас беларуса" 1926, № 22 ад 13 кастрычніка, с. 2.

[457] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 96, л. 1–9.

[458] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 96, л. 1–9.

[459] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 96, л. 1–9.

кампаніі. Належала вырашыць: ці на будучых выбарах беларусы зноў выставяць самастойны спіс, ці ўвойдуць у склад іншых партыйных фармацый (перадусім латгальскіх), якія мелі большыя шанцы на перамогу. Старшыня таварыства К. Езавітаў заклікаў беларусаў аб'яднацца на ўласным нацыянальным грунце і толькі пасля таго выпрацаваць стаўленне да латгальскіх партый. Ён пісаў: "*Строіць якія-колечы планы і камбінацыі на ўваходжанні ў якую-небудзь латгальскую партыю некаторых паасобных беларускіх дзеячаў, або вялікіх груп беларускае меншасці – няма ніякага сэнсу, ды, апрача таго, наогул гэта ёсць вельмі небяспечная рэч. Беларусы не павінны раскідацца і пускацца на розныя падазроныя камбінацыі, каб зноў не папасці на ашуканства. Дзе гарантыі таго, што беларускія імёны і шыльды не будуць выкарыстаны для таго, каб толькі выкарыстаць іх у часе выбарчае агітацыі, а потым зноў на тры гады высунуць беларускай меншасці хвігу? Дык чым большы будзе раскол і развал сярод латгальскіх партый, тым мацней мы павінны гуртавацца і аб'ядноўвацца нацыянальна, самастойна, збіраючы каля беларускіх арганізацый усе свядомыя сілы беларускае меншасці ў Латвіі*"[460].

Аднак практыка паказала, што стварэнне адзінага беларускага палітычнага фронту ў Латвіі было задачай невыканальнай. Перашкодай на шляху да кансалідацыі сіл сталі асабістыя амбіцыі дзеячаў. Напрыканцы 1920-х гг. лагер латвійскіх беларусаў канцэнтраваўся вакол трох лідараў: К. Езавітава, У. Пігулеўскага і М. Дзямідава. Два першыя змагаліся за лідарства ў мясцовым нацыянальным жыцці, абапіраючыся пераважна на беларускае настаўніцтва[461]. Абодва дзеячы адчувалі ўзаемную непрыхаваную антыпатыю. Саперніцтва тлумачылася не толькі амбіцыямі, але і разыходжаннямі ў пытаннях тактыкі беларускай працы і выбару палітычных хаўруснікаў. Уладзімір Пігулеўскі актыўна супрацоўнічаў з латвійскімі сацыял-дэмакратамі, з якімі звязваў надзеі на падтрымку беларускай культурна-асветнай аўтаноміі. Тым часам, К. Езавітаў хіліўся ўлева. Змаганне за правадырства рабілася ўсё больш відавочным і вострым. Дадатковым каталізатарам канфлікту паміж лідарамі былі скорыя выбары ў Сойм III склікання. Узнікла пытанне: з кім і як удзельнічаць у выбарах? Перамагло меркаванне пра немэтазгоднасць выстаўляць у чарговы раз уласны спіс. Як альтэрнатыва бачылася супраца з якой-небудзь агульналатвійскай партыяй[462].

Сімпатыі ўдзельнікаў вагаліся паміж ЛСДРП і Латвійскай партыяй незалежных сацыялістаў (ЛПНС – *Latvijas neatkarīgo sociālistu partija*). Апошняя была створаная на пачатку 1928 г. Незалежныя сацыялісты вялі кампанію

[460] К. Езавітаў, *Крызіс Латгальскіх партыяў*, "Голас беларуса" 1926, № 37, с. 2.

[461] AAN, sygn. 477, t. 5328, Raport Poselstwa RP w Rydze, 12 II 1939 r., dot. działalności białoruskiej na Łotwie.

[462] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 35, л. 7.

супраць сацыял-дэмакратаў, змагаючыся за галасы іх выбаршчыкаў не на жыццё, а на смерць[463]. Яны будавалі лінію на вострай крытыцы сацыял-дэмакратаў, якіх вінавацілі ў ашуканстве працоўных класаў. Партыя выкарыстоўвала папулісцкія лозунгі, накшталт: "Далоў фашыстаў! Няхай жыве адзіны рабочы фронт супраць фашызму! Рукі прэч ад рабочай арміі!"[464] ЛПНС пазіцыянавала сябе як змагарку за сапраўдны сацыялізм, якая паўстала з мэтай "арганізацыі працоўных у Латвіі, дзеля абароны іх інтарэсаў, дзеля барацьбы, у межах дэмакратычнай рэспублікі, за сацыялізм". У пытаннях замежнай палітыкі партыя дэкларавала нейтралітэт, роспуск арміі і ўсеагульнае раззбраенне[465]. З гэтай палітычнай сілай звязаўся К. Езавітаў. Дрэйф дзеяча ў абдымкі левых радыкалаў быў невыпадковы. Савецкія куратары бачылі патрэбу правесці яго ў Сойм. У адным з лістоў А. Ульянава (люты 1927 г.) чытаем: "*Неабходна, безумоўна, скіраваць гэты рух цалкам у наш бок. Калі Вы гэтага не зробіце, Вы страціце ўсялякі ўплыў там. Не забывайцеся, што латвійскія сацыял-дэмакраты ўжо завабілі кагосьці з беларусаў да сябе і ад сябе іх выстаўляць у сойм. Езавітаў, безумоўна, звязаны з намі, і мы павінны яго правесці ў сойм, тым больш, што ёсць усе дадзеныя да гэтага*"[466]. 5 красавіка 1928 г. К. Езавітаў уступіў у ЛПНС і быў яе дзейным сябрам. Перад ЦК партыі ён паставіў пытанне пра заваяванне сімпатый латгальскай вёскі і працоўных Рыгі[467]. Ёсць сведчанні, што К. Езавітаў пераклаў праграму і статут партыі на беларускую мову, у адным з лістоў кіраўніцтву ЛПНС ён пісаў пра патрэбу "раскачаць рускую масу ў паўночнай Латгаліі і Рызе"[468]. Беларускі дзеяч стаў на чале Саркандаўгаўскага аддзела ЛПНС, які налічваў 41 чал. Некаторых з іх ён прывёў у партыю сам[469]. Акрамя таго, К. Езавітаў выконваў ролю злучва паміж ЛПНС і беларускімі савецкімі камуністамі, дасылаючы партыйную газету "Vards" у рэдакцыю часопіса "Полымя". Ён пісаў артыкулы ў беларускую савецкую прэсу ("Полымя", "Савецкая Беларусь") пра дзейнасць ЛПНС, назвы якіх гавораць самі за сябе: *Разгром партыі незалежных сацыялістаў*, *Яшчэ аб рэвалюцыйных выступленнях у Рызе*" і *Мірны прыход фашызму ў Латвіі*. У некаторых публікацыях аўтар даваў волю сваім фантазіям (напрыклад, у артыкуле *Манархісты афіцыйна арганізуюцца ў Латвіі*)[470].

---

[463] P. Łossowski, *Kraje bałtyckie na drodze od demokracji parlamentarnej do dyktatury: 1918–1934*, Wrocław 1972, s. 53.

[464] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 88, л. 9–10.

[465] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 89, л. 3, 5.

[466] В. Бароўская, *Алесь Ульянаў: старонкі жыцця (1901–1937)*, Менск 2025, с. 129.

[467] LVVA, 3235 f., 2 apr., 4635 l., 124 lp.

[468] LVVA, 3235 f., 2 apr., 4635 l., 120 lp.

[469] LVVA, 3235 f., 2 apr., 4635 l., 124, 131–132 lpp.

[470] LVVA, 3235 f., 2 apr., 4635 l., 135 lp.

Тым часам, апаненты К. Езавітава таксама дзейнічалі. Прыхільнікі супрацоўніцтва з сацыял-дэмакратамі па чале з У. Пігулеўскім гуртаваліся вакол таварыства "Рунь" і Беларускага цэнтральнага пазыкова-ашчаднага таварыства. Яны карысталіся газетай "Гаспадар", якую К. Езавітаў называў "*па духу свайму блізкая да рэакцыйнага латышскага сялянскага хаўрусу*"[471]. У чэрвені 1928 г. беларускія дзеячы Даўгаўпілса атрымалі адозву падпісаную М. Дзямідавым і Я. Шчорсам: аўтары прапаноўвалі звярнуцца да ЛСДРП з просьбай уключыць У. Пігулеўскага ў спіс кандыдатаў на выбарах у Сойм[472].

З мэтай выпрацоўкі стратэгіі беларускі актыў склікаў у Даўгаўпілсе дзве канферэнцыі – 28 красавіка і 8 ліпеня 1928 г.[473] Ужо падчас першай у беларускім лагеры пазначыліся рознагалоссі паміж прыхільнікамі супрацоўніцтва з ЛСДРП і ЛПНС. Каб пераадолець крызіс, была створаная камісія, якая занялася падрыхтоўкай праекту прынцыпаў выбарчай стратэгіі, а таксама пачала збор сродкаў на выбарчую кампанію і выданне часопіса. Склад камісіі быў наступны: П. Масальскі (старшыня), У. Ціхаміраў (сакратар), Я. Кастылюк, С. Сахараў, А. Сальцэвіч (сябры)[474]. Камісія прадставіла праект, у якім пацвярджала волю не выстаўляць асобны беларускі спіс, а ўключыць сваіх кандыдатаў у спісы агульналатвійскіх партый. Аўтары праекта, прыхільнікі К. Езавітава, прапанавалі, каб беларусы падтрымалі ЛПНС[475]. Гэты крок выклікаў незадаволенасць У. Пігулеўскага і яго прыхільнікаў. У чэрвені 1928 г. А. Сальцэвіч у лісце К. Езавітаву так апісаў сітуацыю: "*Справа з камітэтам гэткая, – засталіся толькі мы тры, усе незалежнікі. Кастылюка напужаў нехта, называючы нас к..., ды тое самае з Сахаравым. Пігулеўскі прыехаў у Дзвінск з паперай на якой маюцца подпісы Дзямідава і Шчорса аб тым, што эсдэкі выставілі ў спіску на віднае месца, і просяць гэта ад імя ўсіх беларусаў Латвіі. Хоча і ў Дзвінску атрымаць подпісы. Мы пратэстуем*"[476].

Прыхільнікі К. Езавітава напярэдадні склікання II канферэнцыі выдалі аднаднёўку "Праца", на старонках якой крытычна ацэньвалі стаўленне сацыял-дэмакратаў да беларусаў: "*Афіцыйна эсдэкі баранілі нашыя інтарэсы ў асобе Райніса. Але ці не была гэта філантропія? Не ведаем. Ці не выклікаў іх на абарону нашых інтарэсаў апазіцыйны настрой? Так здаецца. А факт тое, што пры такой значнай партыі да гэтага часу не існуе*

---

[471] *Соцыяльнае самаўсьведамленьне беларускае нацыянальнае меншасьці ў Латвіі*, "Голас беларуса" 1928, № 59, с. 1.

[472] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 37, л. 9.

[473] LVVA, 3009 f., 1 apr., 3 l., 116 lp., Пратакол № 20 пасяджэння Цэнтральнай управы Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў, 14 IV 1930.

[474] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 88, л. 4.

[475] *Праца Беларускае Выбарчае Камісіі*, "Праца. Аднаднёўку сялянска-работніцкая" 29 VI 1928, с. 3.

[476] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 34, л. 25.

беларуская секцыя. Калі лідару гэтае партыі падносілі запрашэнне на беларускую вечарыну, то той адказаў, што ён з беларусамі нічога супольнага не мае (Лорэнц), і факт тое, што ваш відны дзеяч, партыец Пігулеўскі, за 3 гады нічога не мог зрабіць у партыі для з'арганізавання беларусаў. Ды яшчэ калі беларусы гаварылі з віднымі сябрамі партыі аб беларускім руху, адказвалі: а ўсё ж беларусі – той жа расіей (Стэпе). Ды і ў іх сучасная сітуацыя ў агульналатвійскім маштабе незавідная, бо масы, працоўныя масы: рабочыя ды сяляне адыходзяць ад гэтае партыі"[477]. Аўтары пераконвалі, што адзіным слушным выбарам будзе аб'яднанне сіл з незалежнымі сацыялістамі. Выданне апублікавала нават праграму ЛПНС. Выдаўцы аднаднёўкі падкрэслівалі, што дзеячы гэтай партыі спрыяюць беларусам. Мэтай газеты была ідэалагічная апрацоўка ўдзельнікаў II канферэнцыі, каб схіліць іх да падтрымкі ЛПНС[478].

Што ў рэальнасці маглі прапанаваць беларусам незалежныя сацыялісты? Кіраўніцтва ЛПНС лічыла неабходным падтрымліваць нацыянальна-культурную аўтаномію для нацменаў. На патрэбы агітацыі сярод нелатышкага насельніцтва партыя выдала праграму на розных мовах, у тым ліку – па-беларуску. Кіраўніцтва партыі вырашыла стварыць пры мясцовых аддзелах партыі нацыянальныя секцыі, каб праводзіць сярод нацменаў агітацыю. У партыйнай выбарчай інструкцыі падкрэслівалася, што існаванне нацыянальных секцый асабліва пажадана ў Латгаліі і на Ілукшчыне, дзе нелатышы пражываюць кампактна, і з'яўляюцца беззямельнымі і малазямельнымі сялянамі, якія праз сваю слабую палітычную свядомасць трапляюць пад уплыў мясцовых клерыкалаў і "меньшинственной мелкой буржуазной интеллигенции". Нацыянальныя секцыі ЛПНС мелі задачу сачыць за настроямі нацменаў і тлумачыць кіраўніцтву партыі спецыфіку нацыянальна-культурных і сацыяльна-гаспадарчых патрэб нелашыскага насельніцтва. Прадстаўнікі нацыянальных секцый мелі прадстаўнікоў у мясцовых аддзелах партыі, а таксама ў ЦК[479].

Беларусы таксама апынулася ў полі бачання ЛПНС. 29 красавіка 1928 г. адбыўся сход ініцыятыўнай групы беларускіх актывістаў (К. Езавітаў, П. Масальскі, А. Ціхаміраў, А. Барткевіч) па стварэнні беларускай секцыі ЛПНС. Удзельнікі абралі К. Езавітава прадстаўніком на перамовах з ЦК

---

[477] А. Сальцэвіч, *Перад выбарамі*, "Праца. Аднаднёўка сялянска-работніцкая" 29 VI 1928, с. 1.

[478] Алесь Сальцэвіч пісаў на старонках аднаднёўкі: "*Частка беларускага актыву не толькі спачувае ім, але нават сама стала сябрамі гэнае партыі, каб змагацца за лешую долю працоўнага. І незалежнікі з прыемнасцю даюць прахадное месца нашаму кандыдату, бо яны зацікаўлены, каб іх рух быў масавы, каб падтрымлівалі іх не адны латышы, а ўвесь працоўны люд: беларусы і іншыя*". А. Сальцэвіч, *Перад выбарамі*, "Праца. Аднаднёўка сялянска-работніцкая" 29 VI 1928, с. 1.

[479] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 88, л. 6.

у гэтым пытанні. Сход канстатаваў, што класавая дыферэнцыяцыя беларускай меншасці стала фактам. Было вырашана запрасіць да супрацоўніцтва В. Быкоўскага, А. Сальцэвіча і М. Талерку[480]. У хуткім часе да незалежных сацыялістаў далучылася некалькі былых сацыял-дэмакратаў (А. Сальцэвіч і А. Райко), якія сталі найбольш актыўнымі беларускімі прыхільнікамі ЛПНС у Даўгаўпілсе. Абодва ўключыліся ў кампанію скіраваную супраць былых аднапартыйцаў з ЛСДРП. Сябра Даўгаўпілскай гарадской думы А. Райко намагаўся перацягнуць на свой бок іншых дэпутатаў. Сваёй актыўнасцю А. Райко і А. Сальцэвіч прыцягнулі ўвагу: сацыял-дэмакратычная прэса называла іх "рэнегатамі"[481].

Такім чынам, беларуская секцыя ЛПНС на чале з К. Езавітавым афармілася[482]. Кіраўніцтва незалежных сацыялістаў вырашыла ўключыць К. Езавітава ў спіс кандыдатаў у парламент. Прозвішча беларускага дзеяча апынулася на чацвёртай пазіцыі ў Рыжскім выбарчым спісе ЛПНС[483]. 1 ліпеня 1928 г. К. Езавітаў выступіў на мітынгу падчас адкрыцця аддзела ЛПНС у Даўгаўпілсе, на якім разам з О. Грынбергам агучыў даклад "ПНС і задачы рабочага класа". У прадмове беларус раскрытыкаваў сацыял-дэмакратаў і іх палітыку ў дачыненні да беларускай меншасці[484]. 8 ліпеня падчас чарговага партыйнага мітынгу К. Езавітаў выступіў з дакладам "Рэакцыя ў Польшчы і разгром 'Грамады'". Мітынг прыняў рэзалюцыю з патрабаваннем спыніць пераслед грамадоўцаў. Больш за тое, у рэзалюцыі быў заклік "весці рашучае змаганне з фашызмам, падымаючым галаву – у Латвіі". Рэзалюцыя была апублікаваная ў партыйнай газеце ЛПНС "Vards"[485].

Тым часам, 8–9 ліпеня 1928 г. у Даўгаўпілсе адбылася ІІ канферэнцыя беларускага актыву, у якой ўзялі ўдзел 67 дэлегатаў ад арганізацый і настаўніцтва. Удзельнікі выразна падзяліся на два лагеры: прыхільнікаў ЛПНС на чале з К. Езавітавым і ЛСДРП, якімі кіраваў У. Пігулеўскі. Непаразуменні назіраліся з самага пачатку. Падчас выбараў старшыні канферэнцыі кандыдатура К. Езавітава была адхіленая, а замест яго быў абраны Я. Кастылюк. Першы прайграў з вялікім вынікам: 46 галасоў супраць 17. Не трапіў ён таксама ў склад прэзідыума канферэнцыі (Высоцкі, Юркевіч, Н. Пінская, У. Гусарэвіч), а ўсе рэзалюцыі, якія прапанавалі яго прыхільнікі, не былі прынятыя. На канферэнцыі выступілі К. Езавітаў і А. Райко ад імя беларускай

---

[480] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 31–32 lpp.

[481] *Лидер 'независимых' Сальцевич уже закончил свою 'революционнную карьеру'*, "Латгальская мысль" 1928, № 27 от 5 июля, с. 3.

[482] *У независимых социалистов*, "Двинский голос" 1928, № 35 от 5 июля, с. 1.

[483] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., Ліст К. Езавітава да А. Чарвякова, 8 VIII 1928.

[484] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 88, л. 6, 7.

[485] *Беларускае жыццьцё ў Латвіі*, "Голас беларуса" 1928, № 59, с. 4; НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 15, л. 23.

секцыі ЛПНС і дэпутат Сойма Андрэйс Петрэвіцс (*Andrejs Petrēvičs*) ад імя ЦК ЛСДРП. Апошні казаў пра станоўчае стаўленні сацыял-дэмакратаў да нацменаў і заклікаў беларусаў згуртавацца вакол партыі, каб спыніць хвалю "фашызму", якая ўзмацняецца ў краіне. Напрыканцы прамовы палітык паведаміў пра згоду кіраўніцтва партыі ўключыць У. Пігулеўскага ў спіс кандыдатаў ЛСДРП у Сойм. Кастусь Езавітаў абараняў пазіцыі ЛПНС, спыняючыся на стаўленні партыі да зямельнага пытання, а сацыял-дэмакратаў вінаваціў у супрацоўніцтве з буржуазіяй. Ён прачытаў рэферат "Сацыяльнае самаўсьведамленьне беларускае нацыянальнае меншасьці ў Латвіі", у якім даводзіў, што беларускае нацыянальнае адраджэнне мае ў сваёй істоце класавы характар і паступова прывядзе ад ідэі "адзінага нацыянальнага фронту" да ідэі "адзінага пралетарскага фронту", таму латвійскія беларусы павінны стаць на класавы грунт. На думку выступоўцы, гэтага ад беларусаў патрабуе як гісторыя адраджэння, так і бягучае становішча беларускай меншасці. Ён скрытыкаваў правыя сілы, перадусім Латвійскі сялянскі саюз, які лічыў найгоршым ворагам рабочых і сялян. Падсумоўваючы выступ, ён прапанаваў беларусам ісці на выбары "*адзіным пралетарскім фронтам з Латвійскімі сацыялістычнымі партыямі*"[486].

У сваю чаргу У. Пігулеўскі крытыкаваў ЛПНС сцвярджаючы, што партыя намагаецца вырашыць зямельнае пытанне гвалтоўнымі метадамі "зараз", тым часам, як ЛСДРП выказваецца за паступовае вырашэнне законным шляхам. Яго арыентацыю на сацыял-дэмакратаў падтрымаў М. Дзямідаў. Ён ад імя таварыства "Беларуская хата" і Я. Шчорс ад імя таварыства "Рунь" асудзілі выданне езавітаўцамі вышэйзгаданай аднаднёўкі "Праца"[487]. Першы заклікаў настаўнікаў пакінуць шэрагі Таварыства беларускіх настаўнікаў у Латвіі, паколькі ім кіруе К. Езавітаў. На канферэнцыі далі аб сабе знаць асабістыя супярэчнасці паміж М. Дзямідавым і К. Езавітавым. Першы ў сваёй прамове востра крытыкаваў К. Езавітава не толькі як палітыка, але і як чалавека. Ён адзначыў, што сацыял-дэмакраты не хочуць мець дачынення з К. Езавітавым, бо той "надта мяняе свае перакананні". М. Дзямідаў выкарыстаў супраць апанента звесткі з мінулага адзначыўшы, што ў 1919 г., быўшы камандзірам беларускага палка ў Горадні, К. Езавітаў даў загад страляць у рабочых. У адказ К. Езавітаў аспрэчыў гэта, сцвярджаючы, што М. Дзямідаў як камендант Горадні ў той час мусіў бы загад выканаць[488].

Канферэнцыя скончылася рэзалюцыяй пра гуртаванне беларускага актыву вакол сацыял-дэмакратаў. Вынікі галасавання былі наступныя: 45 – за і 11 – супраць. У рэзалюцыі чытаем: "*Канферэнцыя пастанавіла імкнуцца да стварэння*

---

[486] LVVA, 2125 f., 5 ap., 333 l., 45 lp.

[487] LVVA, 2125 f., 5 ap., 333 l., 45 lp.

[488] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 88, л. 4; Тамсама, спр. 97, л. 1–2.

агульнабеларускага фронту для падтрымкі на выбарах партыі сацыял-дэмакратаў у тым выпадку, калі ў спіс партыі будзе ўключаны гр. Пігулеўскі"[489]. Удзельнікі канферэнцыі вырашылі звярнуцца да ЦК ЛСДРП з прапановай даць беларусам 5 месцаў з правам голасу на партыйным кангрэсе 22 ліпеня ў Рэжыкнэ. Для падрыхтоўкі да перадвыбарчай кампаніі была створаная камісія: ад Даўгаўпілскага павета – С. Красневіч, Д. Казлоўскі, П. Жэрдзі і Я. Клагіш, ад Рыжскага – У. Пігулеўскі, М. Дзямідаў, Я. Шчорс, Р. Плыгаўка, Н. Пінская. Стварэнне камісіі на Лудзеншчыне было даручана У. Пігулеўскаму[490]. Сацыял-дэмакратычная прэса сачыла за ходам беларускай канферэнцыі і вітала яе вынікі. На старонках газет адзначалася: цяжка меркаваць, якія настроі пануюць сярод беларускіх мас Латвіі, але вынікі канферэнцыі сведчаць пра жаданне беларускіх лідараў супрацоўнічаць з сацыял-дэмакратамі[491].

Даўгаўпілская канферэнцыя была працягам, але не канцом сваркі паміж "езавітаўцамі" і "пігулеўцамі". Ніводзін бок не збіраўся складаць зброі тым больш, што стаўкай былі месцы ў Сойме. На старонках "Голасу беларуса" К. Езавітаў аспрэчыў сапраўднасць вынікаў канферэнцыі. Ён тлумачыў, што большасць удзельнікаў складалі настаўнікі, якія службова падпарадкоўваліся У. Пігулеўскаму як кіраўніку БША. На думку К. Езавітава, яго апанент ціснуў на настаўнікаў і прымушаў іх галасаваць за сацыял-дэмакратаў. Доказам ён лічыў тое, што У. Пігулеўскі і яго паплечнікі настоілі, каб фінальнае галасаванне было адкрытым, а не таемным. Нягледзячы на адмоўныя для К. Езавітава вынікі галасавання ён усё ж лічыў канферэнцыю доказам таго, што ў беларускіх шэрагах адбыўся выразны зрух "улева", які не дайшоў да незалежных сацыялістаў спыніўшыся на сацыял-дэмакратах. Дзеяч лічыў, што "*ўся яна* [канферэнцыя – ЕГ] *зразумела патрэбу класавай еднасці з пралетарыятам Латвіі і адмовілася ад думкі ісці сваім асобным нацыянальным спіскам*"[492]. Ён сцвярджаў, што ў беларускай меншасці ўжо адбыўся "*момант сацыяльнае свядомасці і што далей беларусы будуць звязваць свой лёс не з буржуазнымі групоўкамі Латвіі, а з яе працоўнымі гушчамі. Гэта еднасць меншасцяў з пралетарыятам Латвіі зможа наблізіць перамогу латвійскага пралетарыяту над буржуазіяй, а тым самым дасць нашым беззямельным і малазямельным сялянам, рабочым і працоўнай*

---

[489] LVVA, 2125 f., 5 ap., 333 l., 45–46 lpp.

[490] LVVA, 2125 f., 5 ap., 333 l., 46 lp.; НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 97, л. 1–2.

[491] *Рушатся позиции независимых (Конференция белорусский организаций)*, "Латгальская мысль" 1928, № 28 от 12 июля, с. 3.

[492] *2-я беларуская перавыбарчая канфэрэнцыя ў Дзьвінску*, "Голас беларуса" 1928, № 1 ад 10 ліпеня, с. 2; *З жыцьця беларусаў у Латвіі (Ад уласнага карэспандэнта)*, "Савецкая Беларусь" 1928, № 171 ад 26 ліпеня, с. 2.

інтэлігенцыі палепшанне іх цяжкай долі. Няма чаго казаць ужо аб тым, што панаванне пралетарыяту забяспечыць нас і ад нацыянальнага ўціску"[493].

Пасля ліпеньскай канферэнцыі стала зразумела, што беларускія дзеячы пойдуць на выбары рознымі сцежкамі. Кожны бок вёў сваю перадвыбарчую кампанію, дыскрэдытуючы пры гэтым канкурэнтаў. Частка беларускага актыву, якая падтрымала К. Езавітава, удзельнічала ў беларускай секцыі ЛПНС[494] з цэнтрам у Даўгаўпілсе. Там быў створаны філіял ЛПНС (кіраўнік А. Сальцэвіч, сакратар П. Масальскі, сябра У. Ціхаміраў)[495]. Два апошнія з'яўляліся паслядоўнымі прыхільнікамі ЛПНС, яны працавалі сярод гарадскога настаўніцтва[496]. Аднак найбольш эфектыўным дзеячам секцыі заставаўся К. Езавітаў. На сходзе сяброў ЛПНС 21 ліпеня 1928 г. ён прачытаў даклад *Латвійскія працоўныя і нацыянальныя меншасьці*. Пасля гэтага была прынятая партыйная рэзалюцыя: звярнуць пільную ўвагу партыі на працу сярод беларускіх, рускіх, польскіх і латгальскіх рабочых[497]. З мэтай перадвыбарчай агітацыі К. Езавітаў меў намер выдаць аднаднёўку "Незалежны сацыяліст". З невядомых прычын задума засталася няздзейсненай[498].

Дзеячы беларускай секцыі ЛПНС усведамлялі неабходнасць пашыраць кола прыхільнікаў у правінцыі (напрыклад, у Краславе). У лісце (7 жніўня 1928 г.) да А. Райко К. Езавітаў пісаў: "*Наогул трэба ажыўляць працу Беларускай Секцыі, каб яна мела аддзелы ў беларускіх вёсках пад сваімі ўплывамі і каб яна энергійна абслугоўвала іх. Тое, што я не пайду на спіску, нічога не азначае, бо пойдзеш ты і іншыя таварышы нашы. Дык трэба працаваць. Я хачу, каб ты быў абавязкова ў Сойме, інакш Пігулеўскі зацягне нас у балота*"[499]. Некаторыя актывісты секцыі (У. Ціхаміраў, П. Масальскі, М. Талерка, В. Быкоўскі і інш.) вялі партыйную агітацыю ў латгальскай вёсцы. Вось як працу беларускай секцыі ЛПНС характарызаваў адзін з яе сяброў: "*Нашы незалежнікі працуюць ува ўсю: не праходзіць ні аднаго мітынгу, каб там не было беларускіх прадстаўнікоў. Аб беларусах загутарылі. Незалежнікі іншых нацыянальнасцяў глядзяць на нас з пашанай і надзеямі. Стараемся падтрымаць і пашану, і надзеі. Цяжка зараз, калі вучыцельства разбрылося, наладзіць сувязі з вёскай, – а без яе мы – нуль. Змянілі кінафільмы і на*

---

[493] Тамсама.

[494] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 12, л. 19; Тамсама, спр. 17, л. 1.

[495] LVVA, 1632 f., 2 ap., 499 l., 41 lp.

[496] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 37, л. 10.

[497] Э. Екабсонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [у:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 55; *Беларускае жыцьцё ў Латвіі*, "Голас беларуса" 1928, № 1 ад 10 ліпеня, с. 4.

[498] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 37, л. 4.

[499] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 29, л. 10–11зв.

будучым тыдні ўсё-ж-ткі думаем махнуць на дні тры па вёсках. Сродкаў у камісіі няма, а таму мы і прыдумалі кіно. Усё ж аплаціць дарожныя выдаткі. А намеціць на месцах прадстаўнікоў на канферэнцыю – неабходна. 'Працуюць ува ўсю' і нашыя 'тоже белоруссы'"[500]. На практыцы арганізацыйная праца ў правінцыі выглядала так: у вёску альбо мястэчка прыязджаў актывіст з Даўгаўпілса і склікаў мітынг, на якім ахвотныя запаўнялі сяброўскія анкеты[501].

Чым кіраваліся беларусы, якія вырашылі ўступіць у шэрагі беларускай секцыі ЛПНС? Пэўнае ўяўленне дае ўрывак ліста ад жыхара Краславе А. Баркоўскага да К. Езавітава: "*Будучы пакрыўджоны Латышскім урадам, як у зямельнай справе, туташны ўрадзімец і жыхар не атрымаў ні кавалачка зямлі, так і ў другіх, не атрымаўшы жаднай пасады і працы, я даўно стаў у самую левую апазіцыю і ўжо шмат часу як хачу зарганізаваць тутака групу незалежных сацыялістаў як самую леваю легальную партыю. Да гэтага часу мне гэта не ўдалося. Хоць шмат ёсць людзей. Як крысціян, так і (...) спачуваючых гэтай партыі, але ўступаць у яе пакуль што не рупяцца... Мо баяцца, бо хоць яна і легальная, але ў ёй можа быць камуністычны ўплыў. Хоць ён і ў другіх партыях можа быць. Пры гэтым урадзе праўда ідзе бальшое праследаванне прагрэсіўнага руху. Але я як мала маю дык мала магу і страціць і нікога не баюся. З атрыманнем газеты 'Голас беларуса' я вельмі ўзрадаваўся, што наша газета зноў загаварыла і што яна ўступіла на праўдзівы шлях. Бо беларускія масы, як дзеравень, так і гарадоў пераважна састаяць з пралетарыяту і з таго пралетарыяту, з каторым як найгорш абходзяцца. Дык яго ўсе жаданні і ўстрамленні мусяць звяртацца ўлева і на ўсход. Мусяць рыхтавацца да Радавай Беларусі, з каторай ён можа браць прыклад, сілу, мудрасць, стойкасць. А як латышскі ўрад рыхтуецца ўправа і глядзіць на захад, дык працоўныя беларусы і іншые павінны рыхтавацца ўлева і на ўсход, бо інакш гэты ўрад, рэакцыянеры, фашысты і др. могуць перасверыці ўсіх управа, калі не будзе зроблена раўнавага... Як яшчэ незалежнай партыі ў Краслаўцы няма, дык да мяне і не можа быць прымянімы прыград, патрабуючы 2 паручыцеляў з партыі. Тым часам я хацеў бы працаваць, як для ўсіх працоўных, абойдзеных, угняцёных, так асабліва пакрыўджаных беларусаў... Дык, можа, галоўны рэдактар паклапаціўся каб мяне залічылі хоць тымчасам у кандыдаты партыі незалежных сацыялістаў і прыслалі мне якую паперу. Каб мне мець лепшы ўплыў як па арганізацыі партыі, так і да выбараў у Сойм і Краслаўскі самаўрад. Мог бы, таксама распрастраняць адпаедную літаратуру, асведамлення і г.д. Учора я з астатніх грашэй паслаў 5 латаў ахвяры на 'Голас*

[500] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 38, л. 33.

[501] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 37, л. 4.

беларуса', бо чую і шчыра перакананы, што ён наш і крэпка будзе трымаць за нашы справы"[502].

Нягледзячы на руплівасць беларускіх прыхільнікаў ЛПНС ім не ўдалося замацавацца на латгальскім палітычным краявідзе. Працу беларускай секцыі ўскладнялі непаразуменні паміж дзеячамі. Напрыклад, У. Ціхаміраў не жадаў бачыць у спісе кандыдатаў А. Райко, які, на яго думку, не выйшаў з ЛСДРП[503]. Не знайшоў месца ў партыі А. Сальцэвіч, які хутка пакінуў шэрагі ЛПНС[504].

Змагаючыся за галасы выбаршчыкаў, беларускія дзеячы з лагеру ЛПНС і ЛСДРП не шкадавалі ўзаемных абвінавачванняў і крытыкі. Кастусь Езавітаў лічыў, што яго апаненты, засяродзіўшыся выключна на культурна-асветнай працы, зусім не надавалі ўвагі сацыяльна-эканамічнаму жыццю латвійскіх беларусаў, а таму не разумелі сапраўдных патрэб сваіх суродзічаў[505]. Чым бліжэй да галасавання, тым мацней заўважаўся ўхіл К. Езавітава ўлева. Патрэбу ісці на выбары ў складзе ЛПНС ён тлумачыў еднасцю інтарэсаў беларускай меншасці як "сялянска-работніцкай грамады" з пралетарыятам усёй Латвіі. Ён вінаваціў сацыял-дэмакратаў у тым, што яны не жадаюць перагляду зямельнай рэформы, здрадзілі інтарэсы працоўных і саступаюць буржуазіі[506]. Выканаўцаў аграрнай рэформы беларускі дзеяч вінаваціў у несумленнасці і дбанні пра інтарэсы сярэдніх гаспадароў з адначасовым ігнараваннем патрэб найбяднейшых. Заганы падчас правядзенні рэформы былі адной з прычын, па якой К. Езавітаў адмаўляўся ад супрацы з сацыял-дэмакратамі[507]. Акрамя таго, ён крытыкаваў сацыял-дэмакратаў за ўнутрыпартыйныя сваркі. "Старым" сацыял-дэмакратам ён супрацьпастаўляў "маладую і дынамічную" партыю незалежных сацыялістаў, якая, на яго думку, "*па сваёй праграме, тактыцы і духу найбольш адпавядае патрэбам*

---

[502] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 29, л. 10–11зв.

[503] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 38, л. 32.

[504] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 88, л. 6, 7.

[505] У адным з артыкулаў К. Езавітаў пісаў: "*Актыўная беларуская інтэлігенцыя ў Латвіі, занятая ў працягу нескалькіх год культурна-асветнай працай і звязанымі з ёй клопатамі, мала звяртала ўвагі на сацыяльны бок жыцця, а таму і мала ў ім арыентавалася. Новыя пытанні, паднятыя 'Толасам беларуса' і 'Т-вам выбаршчыкаў' былі мала гэтай інтэлігенцыі вядомыя, а таму частка яе, не разумеючы, у чым справа, настарожылася і занепакоілася. Рашучы тон і арыентацыя Т-ва і газеты ў бок працоўных паказаліся гэтай частцы інтэлігенцыі 'задужа левымі і 'небяспечнымі', а таму яна адарвалася ад беларускае працоўнае масы і пайшла шукаць згоды і супрацоўніцтва з правым кірункам латвійскага грамадзянства*". *Соцыяльнае самаўсьведамленьне беларускае нацыянальнае меншасьці ў Латвіі*, "Голас беларуса" 1928, № 59 ад 10 ліпеня, с. 1.

[506] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 90, л. 1.

[507] К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, Рыга 1927, с. 45.

і настроям пралетарыяту Латгаліі"[508]. Дзеяч лічыў апанентаў "палітычна няграматнымі", якія дзеля ўласных амбіцый ахвяравалі агульнабеларускім інтарэсам і будуюць палітычны капітал на барацьбе "з левізной Езавітава". Ён лічыў, што гэта групоўка ніколі не здабудзе сімпатый працоўных беларускіх масаў[509].

Тым часам У. Пігулеўскі таксама атакаваў апанента, публічна звінаваціўшы яго ў пашырэнні радыкальных поглядаў сярод памяркоўных беларусаў[510]. Пазіцыю У. Пігулеўскага падзяляў М. Дзямідаў, які належаў да ЛСДРП[511]. Канфліктам цікавіліся не толькі латвійскія беларусы – К. Езавітаў інфармаваў пра сваё змаганне з "рэакцыяй" прэсу ў БССР, а яго апаненты карысталіся перыядычнымі выданнямі латвійскіх сацыял-дэмакратаў. У лісце З. Жылуновічу К. Езавітаў пісаў: "*Я з групай маладых пайшоў з партыяй незалежных сацыялістаў, а Пігулеўскі з с-д. Пры чым с-д. выступалі і на канферэнцыі, і ў прэсе самым ганебным чынам. Асабліва наваліліся на мяне, бо мая рашучая пазіцыя захоплівае моладзь, а таксама і таму, што выступленні мае на мітынгах у Дзвінску мелі вялікі поспех у рабочых масах. Дык, каб скампраметаваць мяне і партыю, цяпер Дзямідаў і Пігулеўскі распушчаюць аба мне ўсялякія нягодныя плёткі (...) справа ў тым, што і самі яны добра ведаюць усю абсурднасць сваіх заяў, але зрабілі іх цяперака таму, што складаюцца спіскі ў Сойм і яны сваімі лістамі думаюць стварыць такую атмасферу, каб партыі незалежных немагчыма было паставіць маю кандыдатуру (...) Каб бачыў ты адносіны нашы (прынцыповыя) да с.-д., пасылаю табе адозву нашага Дзвінскага Аддзела партыі незалежных. Гэтую адозву варта змясціць у 'Звездзе', 'Савецкай Беларусі', 'Чырв. Полаччыне' і іншых газетах*"[512]. У лісце А. Цвікевічу К. Езавітаў пісаў: "*Каб беларуская маса, кінутая без прэсы і кіраўніцтва, не пайшла за с.-д., куды яе цягне Пігулеўскі (зрабіўся зусім наймітам-чынушай і ўсё бліжэй падыходзе да ролі ўгадоўца-Алексюка, а то і нават Паўлюкевіча; усю сваю кар'еру будуе на змаганні з 'левізной' К. Езавітава), дык я ўвайшоў у партыю незалежных сацыялістаў, якая з'яўляецца партыяй тыпу 'Грамады', а знача і самай левай партыяй у Латвіі. Каб не дапусціць майго ўдзелу ў спіску незалежных, Дзямідаў і Пігулеўскі распусцілі чуткі, што нібыта я ў Горадні расстрэльваў рабочых. Я цягну іх да суда, а сваю кандыдатуру рашуча зняў, бо не хачу псаваць*

---

[508] *Соцыяльнае самаўсьведамленьне беларускае нацыянальнае меншасьці ў Латвіі*, "Голас беларуса" 1928, № 59 ад 10 ліпеня, с. 2.

[509] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., "Чарговая кампанія супроць К. Езавітава". Паведамленні К. Езавітава для прэсы БССР.

[510] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., Ліст К. Езавітава да З. Жылуновіча, без даты; Тамсама, Ліст К. Езавітава да А. Чарвякова, 8 VIII 1928.

[511] LVVA, 3235 f., 5 apr., 255 l., 2 lp.

[512] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., Ліст К. Езавітава да З. Жылуновіча, без даты.

партыі, хаця ж партыя незалежных на сваёй канферэнцыі ўсё-ж-ткі маю кандыдатуру выставіла на 4-е месца нават па Рызе"[513].

Кастусь Езавітаў не вагаўся агітаваць настаўніцтва за ЛПНС нават на старонках выдання "Беларуская школа ў Латвіі"[514], а ў лістах да дзеячаў БССР пісаў, як У. Пігулеўскі выкарыстоўвае рэпрэсіі супраць "нядобранадзейных" настаўнікаў, якія не падтрымліваюць сацыял-дэмакратаў[515]. Напрыклад, сцвярджаў, што У. Пігулеўскі звольніў настаўніцу Марыю Каспяровіч за тое, што яна далучылася да ЛПНС, і толькі пратэст ТБНЛ дапамог ёй вярнуцца ў школу[516].

Празмерны радыкалізм К. Езавітава і яго стаўку на супрацоўніцтва з ЛПНС не падзялялі нават некаторыя яго добрыя сябры і даўнія прыхільнікі. Напрыклад, С. Казека лічыў, што беларусам карысней будзе звязацца з "моцнаю левай латышскаю партыяй", да якіх незалежныя сацыялісты не належалі. Ён лічыў, што "*аб незалежных сацыялістах у латгальскіх вёсках не чутно і мала ёсць надзеі каб за іх спісак вёска падала свой голас*"[517]. Стаўка на ЛПНС не знайшла разумення С. Сахарава. Спачатку ён памяркоўна паставіўся да выбару К. Езавітава, аднак у хуткім часе пачаў дыстанцыявацца ад падтрымкі ЛПНС пакінуўшы 16 чэрвеня разам з Я. Кастылюком камісію па справах выбараў у Сойм[518]. Адзін з даўгаўпілскіх паплечнікаў К. Езавітава па ЛПНС пісаў, што С. Сахараў адмовіўся ад супрацоўніцтва, бо "*думаў, што спісак будзе нацыянальны, а тут – сацыяльны, ды яшчэ не сацыял-дэмакратычны, як гэтага просіць гр. Пігулеўскі*"[519].

Алею ў агонь дыскусіі падлілі зацемкі ў рускамоўным выданні сацыял-дэмакратаў "Латгальская мысль", у якой паведамлялася, што на рыжскім з'ездзе ЛПНС некаторыя ўдзельнікі выказаліся супраць унясення К. Езавітава ў спіс партыйных кандыдатаў. Аднак большасць вырашыла пайсці насустрач беларускаму дзеячу, каб заручыцца падтрымкай выбаршчыкаў-беларусаў. Таксама ананімны аўтар сцвярджаў, што К. Езавітаў з'яўляецца былым рускім палкоўнікам, баптыстам, які, быўшы ў Горадні, загадаў страляць у пратэстуючых рабочых. Акрамя таго, сцвярджалася, што К. Езавітаў у 1922 г., нібыта, далучыўся да праваслаўнай парафіі і ў знак пакаяння прынёс званы і свечкі[520].

---

[513] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., Ліст К. Езавітава да А. Цвікевіча, 8 жніўня 1928 г.

[514] *Раскол у партыі сацыял-дэмакратаў. Новая партыя незалежных сацыялістаў*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1928, № 8(1), с. 123.

[515] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 196–197 lpp. Ліст К. Езавітава да М. Каспяровіча, 5 ліпеня 1929 г.

[516] LVVA, 3235 f., 2 apr., 4635 l., 114 lp.

[517] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 32, л. 1зв.

[518] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 90, л. 2.

[519] НАРБ, ф. 458. воп. 1, спр. 38, л. 33 зв.

[520] У артыкуле чытаем: "*ЦК не счел, однако, возможным не вставить в список одного из своих сотрудников, долженствующего, притом, служить приманкой для белорусских голосов,*

Імаверна, аўтарам публікацыі з'яўляўся М. Дзямідаў, які схаваўся пад псеўданімам "Раб. К.Я."[521]. Кастусь Езавітаў быў пакрыўджаны і палічыў публікацыю палітычнай правакацыяй з боку сацыял-дэмакратаў, якія помсцілі яму за супрацоўніцтва з незалежнымі сацыялістамі. Ён запатрабаваў ад выдання надрукаваць абвяржэнне, збіраўся падаць у суд на аўтара зацемкі і галоўнага рэдактара за паклёп. Дзеяч звярнуўся да сяброў з Даўгаўпілсу, Вільні, Коўна, Прагі і Менска з просьбай выступіць сведкамі падчас працэсу[522]. Акрамя таго, ён прасіў (20 ліпеня 1928 г.) літоўскага вайсковага аташэ ў Латвіі палкоўніка Баліса Гедрайціса засведчыць, што К. Езавітаў камандаваў гарадзенскім палком кароткі час і быў прызначаны на пасаду прагрэсіўнымі беларускімі дзеячамі з мэтай беларусізацыі палка[523].

Незадаволенасць У. Езавітава ўзмацняў факт, што на публікацыю звярнула ўвагу рускамоўная прэса ("Сегодня" 1928, № 189), у якой прыводзілася думка, што згаданая публікацыя спрычынілася да яго фіяска падчас ліпеньскай

и... г. Езовитов, полковник русской армии, быв. гроденск. 'Военачальник', стрелявший в рабочих, баптист и бывш. кандидат русского православного списка будет красоваться на одном из первых мест в 'пролетарском' списке независимых". Г. М., *Независимцы передрались,* "Латгальская мысль" 1928, № 30 от 25 июля, с. 2.

[521] Вось поўны змест зацемкі: "*Я рабочий человек, ищущий праву, справедливости, посещаю все собрания, в том числе и собрания независимых. Вы, гр. Езовитов, выступаете в роли 'спасителя' 'гибущей'страны. Вы прызываете организоваться. Все это хорошо! Но когда Вы начинаете ругать социал-демократов, которые не за страх, а за совесть десятки лет борются за лучшее будущее трудящихся, Вы выдаете себя головой. Разрушить созданное легко! Но создать новое архитекторам-лидерам, хотя бы из полковников, не очень-то легко. И вот я хочу спросить Вас, гр. Езовитов, что Вы делали и где были, когда социал-демократы боролись на деле за трудящихся? Не ВЫ ли тот Езовитов, который, состоя начальником гарнизона в Гродно, отдал приказ войскам стрелять в рабочих (и залп был дан!). Не Вы ли тот Езовитов, который в 1922 году записался в однин из православных приходов г. Двинска и для 'покаяния' принесли в подарок колокола и свечи? Не Вы ли тот Езовитов, который еще в прошлом году были ярым баптистом и советовали, особенно белоруссам, всем креститься и даже подумывали о 'обетованной земле' в Бразилии. А в этом году Вы стали независимым? От человека, который прошел столько пертурбаций, нельзя ожидать искренности и справедливости в его новом изменении. Предав гласности эти факты, причем кое о чем еще пока умалчивая, одного хочу достигнуть – чтобы робочие убедились, с кем имеют дело. А вывод рабочие сами сделают*". Раб. К. Я., *Кто руководит 'независимым' движением (Открытое письмо лидеру независимых Езовитову),* "Латгальская мысль" 1928, № 28 от 12 июля, с. 3.

[522] 9 жніўня 1928 г. К. Езавітаў звярнуўся да А. Луцкевіча, якога прасіў не адмовіць у дапамозе абараніць яго гонар (НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 15, л. 19). У гэты ж дзень лідар латвійскіх беларусаў накіраваў ліст С. Якавюку, у якім прасіў былога дэпутата польскага Сойма дапамагчы ў атрыманні адпаведных сведчанняў ад былых афіцэраў беларускага палка (НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 18, л. 26). У лісце да А. Чарвякова К. Езавітаў адзначаў, што ніводнае беларускае вайсковае фарміраванне ніколі не выступала супраць рабочых (LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., Ліст К. Езавітава А. Чарвякову, 8 жніўня 1928 г.).

[523] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 13. Л. 16.

канферэнцыі[524]. Кастусь Езавітаў вырашыў бараніцца на старонках рускамоўнай прэсы. Ён змясціў у газетах "Сегодня" і "Латгальская мысль" абвяржэнне інфармацыі пра яго ўдзел у расстрэлах рабочых у Горадні[525]. У зацемцы, надрукаванай у газеце "Латгальская мысль", К. Езавітаў падкрэсліваў, што заўсёды лічыў сябе сацыялістам і падзяляў прынцыпы класавай барацьбы, таму няма дзіва, што звязаўся з Латвійскай партыяй незалежных сацыялістаў. Аўтар лічыў, што яго апанент звярнуўся да хлусні, каб скампраметаваць К. Езавітава як сацыялістычнага работніка. Ён прапанаваў ананімнаму аўтару раскрыць псеўданім і абараняць годнасць перад трацейскім судом[526]. Адначасова К. Езавітаў звярнуўся ў Даўгаўпілскі камітэт ЛПНС з прапановай надрукаваць абвяржэнне на старонках партыйнай прэсы, а таксама патрабаваць ад ЛСДРП трацейскага суда[527]. Тым часам, на старонках рускай газеты "Слово" (5 верасня 1928 г.) К. Езавітаў надрукаваў зацемку *Предвыборные циркуляры главы белорусского отдела Пигулевского*. Аўтар сцвярджаў, што У. Пігулеўскі пагрозамі прымушаў настаўнікаў падтрымаць сацыял-дэмакратычны спіс на выбарах. У. Пігулеўскі ў адказ запатрабаваў ад рэдакцыі абвяржэння, даводзячы, што змест артыкула не адпавядае рэчаіснасці[528].

Сваркі К. Езавітава і У. Пігулеўскага адмоўна адбіваліся на арганізацыйнай працы беларускай меншасці, бо, як прызнаваў першы, яны пачаліся "*якраз у такі момант, калі нападкі іншых ворагаў можна была ўжо лічыць аканчальна разбітымі і далейшы развой беларускага руху залежаў ужо толькі ад саміх беларусаў і ступені іхняе грамадскае свядомасці і энергіі*"[529].

Выбары ў Сойм III склікання адбыліся 6 і 7 кастрычніка 1928 г. Іх вынікі ў Латгаліі адлюстравалі змены на латвійскай палітычнай сцэне канца 1920-х гг. Багатае жніво сабрала навастораная палітычная фармацыя – Народнае аб'яднанне прагрэсу. Партыя атрымала 29 449 галасоў, што ёй дало 3 дэпутацкія мандаты. Частка жыхароў Латгаліі традыцыйна аддала галасы за польскіх і рускіх кандыдатаў. Апошнія балатаваліся па некалькіх выбарчых спісах. Добры вынік мелі і мясцовыя латгальскія партыі. Пераможцамі ў правінцыі аказаліся правыя клерыкалы "Латгальскія хрысціянскія сяляне і каталікі" (епіскап Язэпс Ранцанс), за якіх прагаласавала 47 230 жыхароў Латгаліі. Незалежныя сацыялісты, на якіх зрабіў стаўку К. Езавітаў, атрымалі ў Латгаліі 9 511 галасоў і правялі ў парламент аднаго прадстаўніка. Аднак

---

[524] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 90. Л. 4.

[525] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 15, л. 14.

[526] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 58, л. 1.

[527] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 25, л. 7.

[528] LVVA, f. 2924, apr. 1, l. 80, lp. 127.

[529] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., *Чарговая кампанія супроць К. Езавітава*. Паведамленні К. Езавітава для прэсы БССР.

гэта не прынесла практычнай карысці беларусам. Спроба К. Езавітава трапіць у парламент са спісу ЛПНС скончылася паразай. Тым часам, стаўка У. Пігулеўскага на супрацу з сацыял-дэмакратамі цалкам сябе апраўдала. Хоць вынікі, у параўнанні з папярэднімі гадамі, былі для сацыял-дэмакратаў горшыя (у Латгаліі за партыю прагаласавала 25 352 чал., што дало 3 мандаты), па-ранейшаму ЛСДРП была адной з найбольш уплывовых палітычных сіл Латвіі[530]. У 1928 г. У. Пігулеўскі атрымаў дэпутацкі мандат як сябра ЛСДРП[531].

У 1928 г. беларусы трапілі і ў органы мясцовага самакіравання. Агітацыя вялася па лініі Даўгаўпілскага аддзелу ТБНЛ, сябры якога актыўна ўдзельнічалі ў кампаніі[532]. На муніцыпальныя выбары беларускі актыў ішоў як самастойна, так і ў супрацоўніцтве з сацыял-дэмакратамі. У выніку ў Даўгаўпілскую гарадскую думу прайшло два беларусы – па адным ад кожнага спіса. У гарадское самакіраванне трапіў С. Сахараў як кандыдат нацыянальнага спіса[533]. У Лудзенскай гарадской думе беларускія інтарэсы бараніў Елістрат Чарняўскі, сябра педрады беларускай школы і адзін з былых кіраўнікоў лудзенскага аддзела таварыства "Бацькаўшчына"[534]. У 1928 г. у спіс кандыдатаў ЛСДРП у рыжскае самакіраванне быў унесены У. Пігулеўскі. Аднак яму не ўдалося трапіць у склад самакіравання. Як з'едліва пісаў К. Езавітаў, прычынай было тое, што "*шавіністычна-нацыяналістычныя настроі сярод сацыял-дэмакратаў аказаліся вельмі моцнымі і яны, без усялякае цырымоніі і сарамлівасці, пачалі пры галасаванні выкрэсліваць са спіска ўсіх сваіх партыйных таварышоў, якія не з'яўляюцца латышамі*"[535].

Аднак галоўным вынікам выбарчых кампаніі 1928 г. для беларусаў было абранне прадстаўніка ў парламент. Уладзімір Пігулеўскі стаў першым і адзіным беларусам у латвійскім Сойме. Адначасова ён быў дэлегаваны фракцыяй ЛСДРП у склад соймавай камісіі па справах асветы, што давала яму магчымасць у парламенце бараніць правы беларускай меншасці[536]. У 1929–1932 сацыял-дэмакраты ўваходзілі ва ўрадавую кааліцыю, таму дэпутат-беларус,

---

[530] *Latvijas Republikas Saeimas vēlēšanas 1928 gadā*, tekst un redakcija M. Skujenieka, Rīgā 1929, s. 19.

[531] AAN, sygn. 477, t. 5328, Raport Poselstwa RP w Rydze, 12 II 1939 r., dot. działalności białoruskiej na Łotwie.

[532] LVVA, 2924 f., 1 apr., 80 l., 13 lp.

[533] Э. Екабосонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [у:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 52.

[534] Люцынскі, *Памёр люцынскі беларускі дзеяч Е. Чарняўскі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 6(23), с. 352.

[535] *Асьветная Камісія Рыскае Думы*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1928, № 8(1), с. 132.

[536] *Асьветная Камісія Рыскае Думы*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1928, № 8(1), с. 132.

удзельнічаў у дзяржаўным кіраванні. У лютым 1930 г. ён быў кааптаваны ў склад прэзідыума Таварыства нацыянальных меншасцей садзейнічання Лізе Нацый[537]. 25 траўня 1930 г. У. Пігулеўскі даў прадстаўнікам беларускай грамадскасці першую справаздачу пра вынікі сваёй дзейнасці ў парламенце[538]. Згадкі пра соймавую працу У. Пігулеўскага змяшчала рускамоўная прэса. Газета "Сегодня вечером" (8 лютага 1930 г., № 32) пісала пра размову У. Пігулеўскага з архіепіскапам Іаанам Померсам у будынку парламента. Архіепіскап падкрэсліў, што беларусы сацыялістамі не могуць быць, бо яны набожныя, а сацыял-дэмакраты не ходзяць у царкву. Таксама ён адзначыў, што У. Пігулеўскі рэдагуе газету, якая выходзіць па-руску, а не па-беларуску. Адначасова ўладыка выказаў сумнеў наконт беларускасці У. Пігулеўскага, сцвярджаючы, што яго бацькі лічылі сябе рускімі. У адказ на гэта беларускі дзеяч пажартаваў, цытуючы прымаўку: "У сям'і не без урода". Гэтая сцэна была адлюстраваная ў карыкатуры на старонках газеты[539]. Справа мела працяг, бо ў адным з наступных нумароў У. Пігулеўскі апублікаваў удакладненне, падкрэсліваючы, што яго бацькі не толькі былі беларусамі, але таксама бралі ўдзел у беларускім культурным жыцці, а ўладыка Іаан ніколі не быў з імі знаёмы[540].

Ці карыстаўся У. Пігулеўскі дэпутацкімі правамі, каб дапамагаць беларускай нацыянальнай справе ў Латвіі? Меркаванні на гэты конт былі падзеленыя. Беларускі актыў, які групаваўся вакол К. Езавітава, крытычна ацэньваў дзейнасць У. Пігулеўскага. Аналіз яго парламенцкай актыўнасці дазваляе зрабіць выснову, што, хоць гэты дзеяч і пазіцыянаваў сябе як дэпутат-беларус, вялікай карысці яго прысутнасць у Сойме беларускай справе не прынесла. Абавязкі дэпутата ён спалучаў з кіраваннем БША, і гэта было прычынай незадаволенасці некаторых актывістаў і настаўнікаў. Яны лічылі, што праца ў Сойме перашкаджала належным чынам займацца справамі беларускіх школ (гл. раздзел III). Варта памятаць, што ў парламент У. Пігулеўскі трапіў як кандыдат латвійскай партыі. Беларус мусіў лічыцца з партыйнай дысцыплінай і дбаць пра інтарэсы найперш партыі, а не беларускай меншасці. Кіраўніцтва ЛСДРП даручыла У. Пігулеўскаму рэдагаваць рускамоўнае выданне "Трудовая мысль", скіраванае на рускамоўны электарат латвійскіх сацыял-дэмакратаў. На яго старонках беларуская нацыянальная праблематыка займала маргінальнае месца. Апаненты небеспадстаўна лічылі, што

---

[537] НАРБ. Ф. 458. Воп. 1. Спр. 181. Л. 18.

[538] Э. Екабсонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [у:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 57.

[539] *Парламентский блокнот*, "Сегодня вечером" 1930, № 32 от 8 февраля, с. 3.

[540] *Письмо в редакцию*, "Сегодня вечером" 1930, № 5 от 24 февраля, с. 4.

У. Пігулеўскі не выкарыстоўваў свайго патэнцыялу і ўплываў, каб прынесці карысць беларускай справе[541]. Дый партыйная стратэгія часам супярэчыла беларускім інтарэсам. Напрыклад, сацыял-дэмакраты, якія былі ў апазіцыі да цэнтрысцкага ўрада, патрабавалі перагледзець гадавы бюджэт Міністэрства асветы – а гэта азначала скарачэнне выдаткаў на патрэбы нацыянальных меншасцей. Як сябра ЛСДРП, У. Пігулеўскі мусіў галасаваць за змяншэнне бюджэту БША, якім ён жа кіраваў. І ўсё ж з адлегласці часу бачыцца, што стаўка У. Пігулеўскага на сацыял-дэмакратаў была адзіным поспехам латвійскіх беларусаў на парламенцкіх выбарах.

Тым часам, галоўны праціўнік У. Пігулеўскага, К. Езавітаў, пасля 1928 г. апынуўся ў палітычным крызісе. Параза канчаткова пазбавіла яго матэрыяльнай падтрымкі з Менска. Насуперак спадзяванням савецкага боку, К. Езавітаву не ўдалося прыцягнуць беларускі актыў на бок Латвійскай партыяй незалежных сацыялістаў. Гэта пераканала ЦК КП(б)Б, што далейшая супраца з гэтым беларускім дзеячам пазбаўленая сэнсу. Савецкія куратары вінавацілі К. Езавітава ў адсутнасці рашучасці і радыкалізму, што вынікала з "*палітычнага авантурніцтва і шкурніцтва*", а таксама закідалі яму ўплывы У. Пігулеўскага (sic!). Прадстаўнікі савецкага боку адзначалі таксама слабы водгук прыхільнікаў К. Езавітава на падзеі ў Заходняй Беларусі. У *Тэзісах аб стане і чарговых заданнях работы за мяжой* (23 студзеня 1928 г.) чытаем: "*Наша работа, проводимая на Езавитова, не застрахована от 'сюрпризов', не выгодных для нас (сьезд у Двинске и его решения). Слабый отклик на события в Польше, замыкание в латвийские границы. Политический авантюризм и шкурничество Езовитова, влияние на него СД (Пигулевский). Отсюда отсутствие решительности и радикализма в работе*"[542].

---

[541] Сваю крытыку на адрас У. Пігулеўскага выказаў К. Езавітаў у лісце А. Луцкевічу: "*Ул.[адзімір] Вас[ілевіч]. ня хоча заняцца беларускім часапісам і ўсё яшчэ вядзе 'Трудовую мысль' расейскую, якая нам беларусам ніякае карысці не дае. Лаяўся з ім многа, але ён не зрабіў тамака нават беларускага інфармацыйнага аддзела да гэтага часу. Напішыце яму аб гэтым, бо гэта – сорам. Мець у сваіх рукох расейскую газету і не выкарыстаць яе для інфармацыі аб беларускім руху – гэта проста недапушчальна*" (LMAB, f. 21/279, l. 16–19). А вось якім чынам канфлікт паміж К. Езавітавым і У. Пігулеўскім бачыў беларускі дзеяч маладога пакалення Пятро Мірановіч, які пазней пісаў: "*У Рызе К. Езавітаву давялося ўжо змагацца са сваімі беларусамі-'пігулеўцамі'. Пігулеўскі, атрымаўшы становішча начальніка Беларускага аддзела пры Міністэрстве асветы, а пасля прайшоўшы па сацыял-дэмакратычным спіску ў латышскі сойм, прэтэндаваў на галоўную ролю ў беларускім руху ў Латвіі. Фармальна Езавітаў быў адсунуты на задні план, але, дзякуючы сваёй шчырай працавітасці і ахвярнасці, ён карыстаўся і надалей аўтарытэтам і пашанаю, і з ім найбольш лічылася беларуская грамада*" (П. Мірановіч, *Канстанцін Езавітаў* [у:] *Крывіцкія руны. Вып. II: Беларускі культурны мацярык у Латвіі,* рэд. М. Казлоўскі, С. Панізнік, Менск 2017, с. 333–334).

[542] *Знешняя палітыка Беларусі. Зборнік дакументаў і матарыялаў. Т. 3. 1928–1941*, Менск 2001, с. 14.

Тым не менш, К. Езавітаў не перастаў займацца палітычнай працай. Яго галоўнай палітычнай платформай па-ранейшаму з'яўлялася ТБВ. Пасля няўдалых парламенцкіх выбараў 1928 г. існаванне арганізацыі паступова губляла сэнс. У 1928 г. яна часова спыніла дзейнасць[543]. Цікава, што толькі 14 красавіка 1930 г. кіраўніцтва ТБВ прыняло рашэнне лічыць У. Пігулеўскага выбылым са складу таварыства[544]. Арганізацыю аслаблялі сваркі і непаразуменні паміж актывістамі ў правінцыі[545]. Нягледзячы на гэта, К. Езавітаў намагаўся ажывіць арганізацыю. Пад яго ўплывам 14 красавіка 1930 г. сход цэнтральнай управы вырашыў устрымацца ад ліквідацыі таварыства да наступных парламенцкіх выбараў. Таксама пастанавілі правесці новыя выбары цэнтральнага кіраўніцтва і аддзелаў у правінцыі. Кастусь Езавітаў абяцаў, што ператворыць газету "Голас беларуса" ў друкаваны орган таварыства. Ён таксама заявіў пра свой намер на базе ТБВ стварыць Беларускую сацыялістычную партыю. Ідэя не знайшла, аднак, падтрымкі ў іншых беларускіх дзеячаў[546].

Найбольш актыўнымі ў таварыстве ў гэты час былі настаўнікі з Даўгаўпілшчыны, блізкія паплечнікі К. Езавітава. Найперш сярод іх варта згадаць А. Барткевіча, які намагаўся нейтралізаваць палітычны ўплыў У. Пігулеўскага на мясцовае настаўніцтва. Напрыклад, калі 5 ліпеня 1930 г. У. Пігулеўскі наведаў Даўгаўпілс і зладзіў сход настаўнікаў, на якім агітаваў за свой цэнтр. У гэты час А. Барткевіч заклікаў да байкоту. Вось што ён пісаў кіраўніку ТБВ пасля гэтай падзеі: "*Ён* [Пігулеўскі – ЕГ] *назваў усіх няшчырымі а некаторых правакатарамі і паехаў з носам. Пасля гэтага схода вучыцельства засталося яшчэ больш абуранае. Раджу Вам скарыстаць гэты момант, бо не за гарамі выбары (...) Вельмі добра была б, каб Вы прыехалі 15 ліпеня да мяне, я бы сазваў вуч. і абгаварылі б пытанне аб праф. хаўрусе, і іншае. Калі зможаце прыехаць 15-га, то напішыце, штоб я змог бы неафіцыйна склікаць сход у сябе ў хаце больш моцных вучыцялёў, якія будуць працаваць а не будуць балбатаць*"[547]. Аўтар раіў К. Езавітаву актывізаваць працу ТБВ, выкарыстоўваючы тое, што на вакацыі вучні раз'язджаліся да хаты і там маглі б весці агітацыю на карысць арганізацыі[548]. Даўгаўпілскае настаўніцтва не было, аднак, салідарным у стаўленні да К. Езавітава. Палітычныя разыходжанні падаграваліся асабістымі амбіцыямі. З падачы настаўнікаў

---

[543] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 100, л. 12.

[544] LVVA, 3009 f., 1 apr., 3 l., 115 lp.

[545] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., 675 lp., Ліст А. Барткевіча да К. Езавітава, 23 студзеня 1929 г.

[546] LVVA, 3009 f., 1 apr., 3 l., 116 lp., Пратакол № 20 паседжання цэнтральнай управы Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў, 14 IV 1930 г.

[547] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 29, л. 12.

[548] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 29, л. 13.

А. Якубецкага і П. Жэрдзі А. Барткевіч быў адхілены ад кіравання таварыствам "Беларуская хата". У лісце К. Езавітаву ён скардзіўся, што супраць яго выступіла ўсё даўгаўпілскае настаўніцтва[549].

У наступныя гады ТБВ не праяўлялі актыўнасці. Гэта дае падставы лічыць, што першая палітычная арганізацыя латвійскіх беларусаў спыніла існаванне. Віленская "Беларуская крыніца", якая адмоўна ацэньвала працу таварыства, на пачатку 1930 г. пісала, што арганізацыя "памерла ціхай смерцю"[550].

Тым часам набліжаліся чарговыя парламенцкія выбары, якія мусілі адбыцца ва ўмовах новага раскладу сіл на латвійскай палітычнай сцэне. На мяжы 1920-х і 1930-х гг. пачаўся выразны ўхіл управа, аслабелі пазіцыі сацыял-дэмакратаў, спала актыўнасць леварадыкальных сілаў. Наколькі ў першыя гады незалежнасці левыя знаходзіліся ў актыўным наступе, настолькі пры канцы 1920-х гг. яны былі вымушаны перайсці да абароны. Штораз больш заўважнай рабілася дзейнасць праварадыкальных і нацыяналістычных сілаў. Стрыжнем апошніх была моладзь, вайскоўцы і чыноўнікі. Гэтыя змены абумоўліваліся падзеямі на міжнароднай арэне, хоць мелі і ўнутраныя прычыны. Пазіцыі сацыял-дэмакратаў няўхільна слабелі, асабліва ў вёсцы, дзе жыла большасць латвійскіх беларусаў. Латвійскае сялянства, якое на пачатку незалежнасці атрымала зямлю ў выніку аграрнай рэформы, пачало адыходзіць ад сацыял-дэмакратаў. Падтрымка ЛСДРП з боку сялянства цягам 1928–1931 г. скарацілася з 22% да 15%. Нежаданне сялян галасаваць за партыю было вынікам таго, што сацыял-дэмакраты занядбалі сельскую гаспадарку намагаючыся ва ўмовах сусветнага эканамічнага крызісу ратаваць прамысловасць. Пазіцыю сацыял-дэмакратаў аслабіў і раскол ЛСДРП на дзве фракцыі. Наступствы сусветнага эканамічнага крызісу ў Латвіі пачалі адчувацца на пачатку 1930-х гг. Падзенне цэн на сельгаспрадукты, прызначаныя на экспарт, выклікала рост беспрацоўя і гаспадарчы застой.

У такой атмасферы ў 1931 г. пачалася перадвыбарчая кампанія ў Сойм IV склікання (1931/1934). Змены палітычных настрояў адбіваліся і на стаўленні да нацыянальных меншасцей. Пад уплывам сусветнага эканамічнага крызісу, разам з ростам папулярнасці правых палітыкаў, узмацніліся непрыхільныя да нелатышоў настроі. Нацыяналістычная рыторыка была ўласцівая не толькі крайне правым сілам. Заклікі да абмежавання ўплываў нацыянальных меншасцей гучалі нават з вуснаў некаторых цэнтра-правых палітыкаў. Перадусім гэта тычылася эканомікі, але часамі з'яўляліся і заклікі абмежаваць правы нелатышоў у галіне асветы і культуры шляхам фарсіравання

[549] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 29, л. 21.

[550] М., *Z życcia biełarusy ŭ Łatwii*, "Беларуская крыніца", № 4 ад 26 студзеня 1930 г., с. 1.

ўжывання латышскай мовы ў дзяржаўных установах і органах самакіравання, скарачэння школ нацыянальных меншасцей[551].

Па меры набліжэння выбараў у Сойм IV склікання вырасла палітычная актыўнасць беларусаў Латвіі. Змены на латвійскай палітычнай сцэне выклікалі палітычнае перафарматаванне ўнутры беларускага лагера. У снежні 1930 г. была створана Беларуская дэмакратычная партыя ў Латвіі (БДПЛ) (*Baltkrievu demokratiska partija Latvija*). Яна гуртавала былых сяброў ТБВ, ранейшых прыхільнікаў як сацыял-дэмакратаў, так і незалежных сацыялістаў. Старшынём новай фармацыі стаў С. Сахараў, а сярод актывістаў былі: А. Дварэцкі, А. Барткевіч, С. Казека, Крупскі, І. Ігнатовіч. Партыя магла адчыняць рэгіянальныя аддзелы, колькасць сяброў якіх складала не менш 10 чал. Згодна з праграмай, БДПЛ засяроджвала ўвагу на эканамічных і культурных патрэбах латвійскіх беларусаў. Яна ставіла за мэту абарону духоўных, юрыдычных і матэрыяльных правоў беларускай меншасці, узмацненне нацыянальнай свядомасці беларускіх масаў, аб'яднанне беларусаў дзеля выстаўлення ўласных кандыдатаў на парламенцкіх і мясцовых выбарах, супрацу з партыямі, якія маюць падобныя праграмы. Свае мэты БДПЛ магла ажыццяўляць шляхам арганізацыі культурных імпрэз, экскурсій, фільмавых паказаў, працы хораў, выдавання прэсы і іншай друкаванай прадукцыі, арганізацыі бібліятэк і моладзевых гурткоў[552].

Партыя магла дзейнічаць на тэрыторыі ўсёй Латвіі, але яе кіраўнікі падкрэслівалі, што будуць надаваць асаблівую ўвагу Латгаліі і Ілукшчыне. Наогул кіраўніцтва партыі бачыла патрэбу аб'яднання Ілукштанскага павета і Латагаліі ў адну адміністрацыйную адзінку. Агульнапалітычныя прынцыпы ўключалі ў сябе падтрымку дэмакратычнага ладу латвійскай дзяржавы, роўных правоў для ўсіх грамадзян, незалежна ад нацыянальнасці, у форме нацыянальна-культурнай аўтаноміі, абарону грамадзянскіх правоў, шырокія кампетэнцыі органаў мясцовага самакіравання, свабоду сумлення і рэлігіі. Эканамічная праграмы партыі прадугледжвала правядзенне аграрнай рэформы шляхам падзелу буйных зямельных надзелаў і раздачы іх сялянам з аднолькавымі магчымасцямі для ўсіх нацыянальных груп. Дзеячы БДПЛ патрабавалі дзяржаўнай дапамогі для беззямельных і малазямельных сялян у выглядзе пазык і крэдытаў. Партыя патрабавала выкарыстоўваць лясныя рэсурсы Латгаліі выключна на патрэбы гэтага рэгіёну. Актыўна прапагандавалася кааператыўная дзейнасць сярод сялян. У сферы культуры і асветы падкрэслівалася права ўсіх грамадзян на бясплатную абавязковую асвету,

---

[551] P. Łossowski, *Kraje bałtyckie na drodze od demokracji parlamentarnej do dyktatury: 1918–1934*, Wrocław 1972, s. 68, 71–72, 76–77.

[552] *Статут Беларускай дэмакратычнай партыі ў Латвіі* [у:] *Крывіцкія руны. Вып. II: Беларускі культурны мацярык у Латвіі*, рэд. М. Казлоўскі, С. Панізнік, Менск 2017, с. 382–389.

прыстасаванне школ да патрэб сацыяльна-эканамічнага жыцця. БДПЛ бараніла правы беларускай меншасці на атрыманне ад дзяржавы і органаў самакіравання сродкаў на развіццё і функцыянаванне пачатковых і прафесійных школ з роднай мовай навучання. Партыя таксама адстойвала правы беларусаў атрымліваць ад дзяржавы сродкі на развіццё тэатру і друкаванай прадукцыі[553].

18 снежня 1930 г. статут і праграма партыі былі зацверджаныя МУС, пасля чаго яе актыў пачаў арганізацыйную і прапагандысцкую дзейнасць. Звестуном заснавання партыі стала аднаднёўка "Новы шлях" з праграмнымі ўстаноўкамі БДПЛ. Аднак сталым друкаваным органам БДПЛ стала газета "Думка беларуса", першы нумар якой пабачыў свет 1 чэрвеня 1931 г.

Улетку 1931 г. БДПЛ разгарнула працу на месцах. Першае публічнае мерапрыемства партыі адбылося 24 траўня 1931 г. у Пустыні. Там быў скліканы арганізацыйны сход, у якім ўзялі ўдзел: С. Сахараў, Язэп Клагіш, Данат Чэкст, Часлаў Клагіш, Ігнат Сушынскі, Станіслаў Мацкевіч, Ксаверы Дзяргач, Станіслаў Тоўсцік, Язэп Ісрык, Міхал Клагіш, Франц Клагіш і інш. Прысутныя заснавалі аддзел партыі ў Пустыні (кіраўнік С. Мацкевіч)[554]. У хуткім часе адбыліся чарговыя сходы: 7 ліпеня – у Тартаках (Ілукштанскі павет), 11 ліпеня – у Лудзы і 12 ліпеня – у Залессі (Лудзенскі павет), 9 жніўня – у Ёнінах (Даўгаўпілскі павет). У Залессі С. Сахараў прачытаў даклад пра становішча сялянства, а ў межах дыскусіі прагучала прапанова стварыць у мясцовай школе сельскагаспадарчы і рамесніцкі класы[555]. Партыя мела прыхільнікаў таксама ў Краслаўскай, Істэрскай, Скайсценскай і Прыдруйскай валасцях[556].

Звяртае на сябе ўвагу імкненне дзеячаў партыі ахапіць беларускай нацыянальна-культурнай і эканамічнай працай Ілукшчыну, якой, на іх думку, раней не надавалася належнай увагі. Дзеячы БДПЛ лічылі, што неабходна кінуць на гэта ўсе сілы, каб навярстаць страчаны час[557]. БДПЛ пашырала

---

[553] Тамсама, с. 389–391.

[554] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 101, л. 1.

[555] *Карэспандэнцыі*, "Думка беларуса" 1931, № 3, с. 3.

[556] "Думка беларуса" 1931, № 3, с. 3.

[557] Вартыя ўвагі словы С. Сахарава, які пісаў: "*Можна быць пэўнымі, што беларуская праца ў Ілукшчыне спаткае прыхільнае адношанне па-перш з боку латыскага грамадзянства, а па-другое з боку літвіноў. Латышскае грамадзянства, стоячы на грунце дэмакратычных прынцыпаў сваёй дзяржавы, не павінна дапускаць асіміляцыі аднэй нацыянальнасцю другой. Літвіны-жа – нашы старадаўнія сябры на былым слаўным гістарычным шляху і ў сучасны момант інтарэсы літоўскай і беларускай нацыянальнай меншасці ў Латвіі адны і тыя; развіццё сваёй нацыянальнай культуры. Таму паміж латвійскімі літвінамі і беларусамі могуць быць толькі самыя шчырыя ўзаемаадносіны ўва ўсіх галінах жыцця. Усё гэта адчыняе шырокі прастор для працы Беларускага Аддзела Мін. Прасветы і беларускіх арганізацыяў над свежай беларускай глебай у Ілукшчыне. Магчыма, што мы трошку спазніліся, што мы ўпусцілі некаторы час, але гэта не дае магчымасць ні Беларускаму Аддзелу, ні нашым арганізацыям пакінуць без увагі Ілукшчыну і заставіць сваіх братоў-беларусаў на рукі чужынцаў (...) Беларусы Ілукшчыны! Калі*

ўплывы ў вёсках, спалучаючы палітычную агітацыю з культурнымі імпрэзамі. Напрыклад, 29 жніўня 1931 г. у Даўгаўпілскі аддзел звярнулася кіраўніцтва партыі, якое прасіла зладзіць тэатральныя выступы 13 верасня ў Свентах і 27 верасня ў Лельборне. Партыя брала на сябе ўсе выдаткі звязаныя з пастаноўкай і працай артыстаў[558]. 13 верасня 1931 г. у будынку Свентэнскай школы партыя зладзіла яшчэ адну вечарыну[559].

Няма сумневу, што БДПЛ была створаная з думкай праўдзел у парламенцкіх выбарах. У адным з нумароў газеты "Думка беларуса" даваўся агляд і ацэнка становішча латвійскіх беларусаў напярэдадні выбараў. Аўтары з жалем канстатавалі, што, замест аб'яднання сіл у беларускім асяроддзі паглыбляюцца падзелы, якія зніжаюць шанцы на поспех. Дзеячы партыі заклікалі суродзічаў адкінуць сваркі дзеля дасягнення агульнай мэты. У адным з артыкулаў адзначалася: "*Такі раздроб невялічкай жменькі беларускіх інтэлігентных сіл у Латвіі наводзіць кожнага на сумныя думкі і тут, незалежна ад вынікаў выбарчай кампаніі ў Сойм, павінна быць у ўсіх беларусаў адна думка: нам неабходна аб'яднанне, аб'яднанне і аб'яднанне вакол сваёй беларускай дэмакратычнай партыі. Уваходжанне паадзіночку беларусаў у другія палітычныя партыі толькі аслабляе нашы сілы, згубляе нацыянальны твар. Такім шляхам, як паказаў вопыт, мы йдзём да заняпаду. Паглядзіце, беларусы, як ідуць іншыя меншасці: палякі і немцы – адзіным фронтам, нягледзячы на тое, што, пэўна, сярод іх ёсць людзі розных палітычных перакананняў; жыды і расейцы дагаварываюцца аб адзіным фронце. І мы пэўны, што свядомая частка беларусаў глыбока прызадумаецца над гэтым з'явішчам і добра ўразумее, што толькі ў дэмакратычным аб'еданні мы знойдзем сваю моц, а з гэтаю сілаю мы зможамо накіраваць сваю працу на шляху яе далейшага росквіту*"[560].

Кіраўніцтва БДПЛ вырашыла рыхтавацца да выбараў. Разумеючы, аднак, што выстаўляць самастойны беларускі спіс бесперспектыўна, было вырашана шукаць падтрымкі сярод латвійскіх палітыкаў. У прыватнасці, была зроблена спроба ўвайсці ў саюз з Партыяй прагрэсіўных сялян (ППС). Першапачаткова дзеячы БДПЛ разлічвалі на тое, што прагрэсісты пагодзяцца вылучыць беларусам у сваім выбарчым спісе 3 месцы ў Латгаліі і 6 – у Земгаліі. Апрача таго, кіраўніцтва БДПЛ спадзявалася на атрыманне ад

шануеце вы сябе, калі жадаеце сабе лепшага жыцьця, дык запісвайцеся ў сябры сваёй Беларускай дэмакратычнай партыі, адчыняйце аддзелы яе па сваім вёсках, пішыце аб сваіх патрэбах ці Цэнтральнаму Камітэту партыі, ці ў рэдакцыю нашае часопісі". *Мост у Ілукшчыну*, "Думка беларуса" 1931, № 2, с. 1.

[558] LVVA, 1747 f., 1 apr., 28 l., 21 lp.

[559] Праграма вечырыны складалася з перадвыбарчай прамовы С, Сахарава, спектакляў *Мікітаў лапаць* і *Пасланец*, танцаў. НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 101, л. 5.

[560] *Выборы ў Сойм і беларусы*, "Думка беларуса" 1931, № 3, с. 1.

прагрэсістаў матэрыяльнай дапамогі на выданне прэсы, скліканне перадвыбарчага з'езда і іншыя выдаткі, звязаныя з перадвыбарчай кампаніяй. Узамен БДПЛ абяцала латышам, абавязаць дэпутата-беларуса да захавання лаяльнасці і актыўнасці ў фракцыі ППС. У пытаннях, звязаных з беларускімі інтарэсамі, БДПЛ разлічвала на падтрымку фракцыі прагрэсістаў. Аднак, зыходзячы з палітычных рэалій, беларускі бок быў вымушаны абмежаваць свае патрабаванні. У выніку было вырашана прапанаваць выставіць па Латгаліі кандыдатуры С. Сахарава і М. Клагіша, а па Земгаліі – С. Сахарава і А. Базновіча[561]. У ліпені 1931 г. дзеячы БДПЛ звярнуліся да прагрэсістаў з прапановай супрацоўніцтва ў абмен на ўнясенне 1–3 прадстаўнікоў БДПЛ у выбарчы спіс кандыдатаў ППС на тэрыторыі Латгаліі. Перамовы не далі, аднак, чаканых вынікаў. Прагрэсісты не пагадзіліся ўключыць у свой спіс беларускіх прадстаўнікоў, але і не адмовіліся ад супрацоўніцтва з беларусамі, прапануючы, каб беларускія дзеячы заклікалі свой электарат падтрымаць кандыдатаў ППС. Апошнія ў сваёй парламентарнай працы абавязаліся ўлічваць інтарэсы беларускай меншасці. Беларускаму боку нічога не заставалася, як пагадзіцца на такія ўмовы[562].

Адначасова дзеячы БДПЛ рабілі спробы стварыць саюз з прадстаўнікамі літоўскай меншасці на Ілукшчыне. 16 чэўраня 1931 г. у Рызе адбыўся кангрэс латвійскіх літоўцаў, на які былі запрошаны прадстаўнікі БДПЛ С. Сахараў і А. Барткевіч[563]. Удалося дасягнуць паразумення, і ў Земгаліі быў зарэгістраваны супольны літоўска-беларускі спіс № 20 ("Спіс літоўцаў-каталікоў і беларусаў"). У яго ўваходзілі 14 кандыдатаў, у тым ліку 3 беларусы: С. Сахараў, настаўнік Гараўскай школы і беларускі актывіст на Ілукшчыне Данат Далецкі і селянін Скайценскай воласці Ігнат Завадскі. Беларусы былі размешчаны ў выбарчым спісе адпаведна на 5-м, 7-м і 11-м месцах. Выбар хаўрусніка беларускія дзеячы абгрунтоўвалі наступным чынам: "*Мы пайшлі з ліцвінамі не толькі таму, каб быць больш моцнымі на выбарах, а і таму, што тут, у Латвіі, з нацыянальных меншасцяў нас і нашы патрэбы больш усяго могуць зразумець ліцвіны – гэтыя старадаўнія нашы сябры на гістарычным шляху. Для нас зусім аднолькава – хто пройдзе па спіску № 20 – літовец ці беларус, бо як адзін, так і другі будзе аднолькава бараніць інтарэсы ліцвінаў і беларусаў*"[564].

Выбарчая праграма літоўска-беларускага спісу была наступная: 1) шырокая падтрымка сельскай гаспадаркі шляхам крэдытаў на агранамічную дапамогу і кааператыўную дзейнасць; 2) павелічэнне надзелаў малазямельных

---

[561] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 101, л. 4.

[562] *Выборы ў Сойм і беларусы*, "Думка беларуса" 1931, № 3, с. 1.

[563] *Кангрэс літвіноў*, "Думка беларуса" 1931, № 2, с. 2.

[564] *№ 20. Беларусы! № 20*, "Думка беларуса" 1931, № 4, с. 1.

сялян шляхам меліярацыі і асушэння багнаў, а таксама за кошт парцэляцыі маёнткаў, якія засталіся ў валоданні дзяржавы; 3) перагляд зямельнай рэформы; 4) палёгкі падчас сплаты пазык; 5) прапарцыйны падзел падаткавага цяжару сярод усяго насельніцтва краіны; 6) зніжэнне падаткаў для сялянскіх гаспадарак у сувязі з падзеннем цэн на сельскагаспадарчыя тавары; 7) развіццё прамысловасці з мэтай атрымання сялянамі магчымасці працы ў горадзе; 8) рамонт дарог коштам дзяржавы; 9) забеспячэнне беларусаў і літоўцаў працай у прамысловасці, дзяржаўных органах і мясцовым самакіраванні; 10) ашчаднае выкарыстанне народных сродкаў і змяншэнне бюджэтных выдаткаў да самага неабходнага; 11) паляпшэнне медычнага абслугоўвання ў вёсцы; 12) пашырэнне беларускай і літоўскай пачатковай, прафесійнай і пазашкольнай асветы[565].

Дзеячы БДПЛ на старонках партыйнай прэсы складалі прагнозы адносна вынікаў выбараў. Яны разлічвалі, што спіс № 20 можа атрымаць падтрымку каля 6 тысяч вабаршчыкаў, што давала 1–2 месцы ў парламенце. У гэтых разліках бралася пад увагу колькасць насельніцтва правінцыі. Паводле ўсеагульнага перапісу, у 1930 г. у Земгаліі пражывала 12 672 літоўцаў і 6 132 беларусаў. Дзеячы БДПЛ лічылі, што не менш як 25% з іх падтрымае літоўска-беларускі спіс. Акрамя таго, беларускія дзеячы спадзяваліся, што 1–1,5 тыс. літоўцаў і беларусаў – прыхільнікаў спіса № 20 прыедзе на выбары ў Земгалію з Рыгі і іншых рэгіёнаў Латвіі[566]. З іншага боку, узяўшы пад увагу тое, што беларускія кандыдаты атрымалі ў спісе далёка не першыя месцы, можна меркаваць, што яны цвяроза ацэньвалі сітуацыю і разумелі, што хутчэй за ўсё не правядуць свайго кандыдата ў Сойм. Аднак дамова з літоўцамі давала беларусам гарантыю, што ў выпадку, калі ў парламент трапіць літоўскі прадстаўнік, ён будзе абараняць правы беларускай меншасці. Патэнцыйным электаратам спісу № 20 акрамя літоўскага насельніцтва былі мясцовыя каталікі. Недахопам спісу была адсутнасць святароў: вышэйшае духавенства забараніла святарам-літоўцам удзельнічаць у выбарах кандыдатамі. У межах літоўска-беларускага перавыбарчага супрацоўніцтва ў жніўні 1931 г. дзеячы БДПЛ узялі ўдзел у мітынгу ў Грыве[567].

20 верасня 1931 г. пад кіраўніцтвам А. Дварэцкага адбыўся І з'езд дэлегатаў БДПЛ з удзелам 42 прадстаўнікоў рэгіянальных аддзелаў. Перад дэлегатамі

---

[565] *Чаго будуць дамагацца кандыдаты літоўска-беларускага сьпіску № 20 у Сойме*, "Думка беларуса" 1931, № 5, с. 3–4.

[566] С. Сахараў, *Ці мае шансы на правядзеньне свайго кандыдата ў Сойм Літоўска-Беларускі сьпісак № 20 па Земгаліі?*, "Думка беларуса" 1931, № 4, с. 3.

[567] D. Mačiulis, *Lietuvos pasiuntinybės pastangos konsoliduoti lietuvių bendruomenę tarpukario Latvijoje*, "Lietuvos istorijos metraštis" 2007, № 2, Vilnius: LII leidykla, 2008, p. 42; D. Mačiulis, Ē. Jēkabsons, *Lietuviai Latvijos Respublikoje 1918–1940 metais*, Vilnius 2018, s. 130–132, 134–135.

выступіў прадстаўнік ППС, дэпутат Сойма Юрыс Паберж (*Juris Pabērzs*). Палітык аспрэчыў пашыраную сярод беларусаў і латышоў думку, што, нібыта, прагрэсісты не дбаюць пра інтарэсы нацыянальных меншасцей. Ён патлумачыў, што беларускія кандыдаты не былі ўключаныя ў выбарчыя спісы ППС, бо ўлетку, калі адбываліся перамовы паміж БДПЛ і прагрэсістамі, апошнія знаходзіліся ў арганізацыйнай стадыі, таму па аб'ектыўных прычынах не былі ў стане задаволіць жаданні беларускага боку. Палітык падкрэсліў, што яго партыя будзе абараняць правы беларусаў на пачатковыя і сярэднія школы. Ён звярнуўся да дэлегатаў з заклікам падтрымаць на выбарах прагрэсістаў, якія, на яго думку, самыя блізкія латгальскім беларусам і паводле духу, і праграмы. У сваю чаргу С. Сахараў заклікаў прысутных падтрымаць кандыдатаў ППС у Латгаліі і літоўска-беларускі спіс – у Земгаліі. Удзельнікі падтрымалі ідэю выбарчага саюзу з літоўцамі і заклікалі ўсіх, хто можа, у дзень выбараў наведаць Земгалію, галасаваць за літоўска-беларускі спіс. Дэлегаты абмеркавалі таксама пытанне канкурэнцыі, асабліва стаўленне партыі да сацыял-дэмакрата У. Пігулеўскага. Прагучала меркаванне, што з пачаткам сяброўства ў ЛСДРП ён занядбаў інтарэсы беларускай школьнай справы. Некаторыя дэлегаты адмоўна ацанілі тое, што ён выдаваў рускамоўную сацыял-дэмакратычную газету "Трудовая мысль", у той час, як беларусы мелі цяжкасці з выданнем уласнай прэсы. Сяргей Казека лічыў, што кіраўнік Беларускага школьнага аддзела павінен быць беспартыйны, таму прапанаваў падтрымаць яго толькі пры ўмове, што ў выпадку абрання ў Сойм ён адмовіцца ад пасады ў БША. Аднак прапанова не мела падтрымкі большасці дэлегатаў, якія выказаліся за тое, каб "*у выбарах у сойм зусім не заўважваць ні Пігулеўскага, ні Журкоўскага, і не падтрымаць яго*"[568]. Такім чынам, партыя заняла да кіраўніка БША нейтральную пазіцыю.

З набліжэннем дня галасавання на старонках партыйнай газеты БДПЛ усё больш месца аддавалася выбарчай агітацыі. Дзеячы партыі ішлі на выбары пад лозунгам: "*У аб'яднаньні – моц! Беларус, толькі за беларусаў!*" "Думка беларуса" заклікала не слухаць абяцанняў кандыдатаў іншых партый, а галасаваць за літоўска-беларускі спіс. Аўтары небеспадстаўна лічылі адной з галоўных прычын адсутнасці беларусаў у парламенце выбарчую пасіўнасць і абыякавасць. Яўка сярод выбаршчыкаў-беларусаў была найніжэйшай у параўнанні з іншымі нацыянальнымі групамі[569]. Невыпадкова партыйная газета рабіла такі акцэнт на патрэбе ўдзелу ў галасаванні. Аўтары інфармавалі чытачоў аб працэдуры галасавання і пераконвалі, каб ніхто ніякім чынам не ўхіляўся ад свайго абавязку. У перадвыбарчай адозве ЦК БДПЛ чытаем: "*Дужа часта*

---

[568] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 101, л. 3–4; *Зьезд дэлегатаў Беларускай Дэмакратычнай партыі*, "Думка беларуса" 1931, № 5, с. 2.

[569] *К победе*, "Думка беларуса" 1931, № 5, с. 1.

адзін голас дае перавагу варожым партыям, а таму ніхто з беларусаў не павінен казаць: 'Абойдзецца і без мяне. Што тамака адзін голас'. Памятайце, што кожны голас пададзены за аб'яднаны літоўска-беларускі спісак № 20 па Земгаліі, умацоўвае становішча беларусаў у Латвіі. А таму – усе да урнаў! Усе – на выбары! Усе галасуйце толькі за свой спісак № 20 па Земгаліі! Не чакайце ад нас крыклівых мітынгаў: мы іх рабіць не збіраемся, бо яны ўсім сталі брыдкімі! Не давайце абдуваць сябе чужацкім агітатарам, а дружна падавайце свой голас за беларуска-літоўскі спісак № 20"[570]. Беларускія дзеячы мусілі лічыцца з шматканфесійнасцю як магчымай перашкодай для кансалідацыі. Таму адзін з выбарчых лозунгах гучаў: "*Ні адзін беларус Земгаліі, будзь католік ці праваслаўны, не павінен галасаваць за чужыя спіскі*"[571].

ППС і літоўска-беларускі спіс не былі адзінымі выбарчымі сіламі, з якімі звязвалі надзеі беларускія дзеячы. Улетку 1931 г. была створаная беларуская секцыя ў складзе палітычнай фармацыі "Хрысціянскія сяляне і каталікі". Гэты палітычны рух быў папулярнай палітычнай сілай у Латгаліі і на кожных выбарах атрымліваў добрыя вынікі. 10 жніўня 1931 г. выйшаў першы нумар газеты "Беларускае слова", органа беларускай секцыі гэтай партыі. Ёсць падставы меркаваць, што секцыя была нешматлікай. Арганізатарам палітычнай групы і рэдактарам "Беларускага слова" быў П. Журкоўскі, беларускі школьны інспектар. Групоўка мела выразна антыкамуністычныя і антысавецкія погляды, як і антыпольскую скіраванасць[572]. На старонках газеты П. Журкоўскі запэўніваў, што палітычныя разыходжанні латвійскіх беларусаў з'яўляюцца прыкметай палітычнага плюралізму, які належыць успрымаць як нармальную з'яву і праяву развіцця беларускага руху. У праграмным артыкуле чытаем: "*На актыўным полюсе беларускага палітычнага жыцця з'явілася беларуская нацыянальна-хрысціянская партыйная група. Недыферэнцыраванымі і нявыкрысталізаванымі палітычна застаюцца яшчэ вялікія масы беларускага сялянства, а між тым, ад актыўнасці гэтага сялянства будуць залежаць і характар, і змест усяго далейшага беларускага нацыянальна-палітычнага жыцця ў Латвіі. Вось чаму, перш за ўсё неабходна прыцягнуць як мага больш гэтага сялянства ў шэрагі беларускай секцыі хрысціянска-сялянскай партыі і тым самым стварыць пад сцягам гэтай партыі арганізаваную армію, якая не толькі павядзе беларускую меншасць у Латвіі да святлейшых дзён, але разам з тым і дасць рашучы адпор усім тым, хто будзе пашыраць нацыянальнае разыходжанне і сеяць нацыянальны раскол сярод беларусаў*"[573].

---

[570] *Як трэба галасаваць на выборах у Сойм*, "Думка беларуса" 1931, № 5, с. 2–3.

[571] "Думка беларуса" 1931, № 5, с. 2.

[572] *Палёнізацыя ў Латвіі*, "Беларускае слова" 1931, № 1, с. 3.

[573] П. Журкоўскі, *Разнагалосьсе і разыходжаньне*, "Беларускае слова" 1931, № 1, с. 1.

Секцыя ставіла за мэту пераканаць беларускае латгальскае сялянства падтрымаць на выбарах латгальскіх хадэкаў. Пятро Журкоўскі акцэнтаваў увагу на патрэбе супрацоўніцтва беларусаў з латгальскімі суседзямі. Удзел у саюзе з латгальскімі хадэкамі ён тлумачыў сацыяльнымі матывамі. У газеце "Беларускае слова" чытаем: "*Стварэнне беларускай секцыі хрысціянска-сялянскай партыі з'яўляецца завяршэннем шырокага жыццёвага працэсу групіроўкі аднародных ідэалагічных элементаў беларускай меншасці ў Латвіі. Папярэдні беларуска грамадска-палітычны рух выявіў, што шырокі фронт аднадумцаў хрысціянска-сялянскай ідэалогіі ахопліваў элементы, не маючы аднаго ясна акрэсленага палітычнага і сацыяльнага твару (...) Але кожны беларус выяўляў сабе твар гэтай групіроўкі па-свайму і таму, калі своечасова не ўкласці расплыўчатае выяўленне ў пэўныя акрэсленыя рамкі, то паўстае небяспека зруйнаваць і тыя абрысы, якія зараз існуюць. Вось чаму, як беларуская секцыя хрысціянска-сялянскай партыі не паўстала толькі з адных праграмных размоў, а створана самім жыццём, самой душой беларускага селяніна*"[574].

Прычыны гаротнага стану беларускай вёскі П. Журкоўскі бачыў у нядбайнай палітыцы левых партый, найперш сацыял-дэмакратаў. Ён заклікаў беларускіх сялян у Латгаліі галасаваць за Хрысціянска-сялянскую партыю, якую ачольваў епіскап Язэпс Ранцанс (спіс № 9). Адначасова ён заклікаў не галасаваць за кандыдатаў левых партый, прагрэсістаў, прадстаўнікоў рускай і польскай меншасці[575]. Дзеячы беларускай секцыі звярталіся да выбаршчыкаў: "*Беларусы! Не паддамося ўгаворам і хітрыкам тых, якія зараз з мяккімі і салодкімі словамі выдаюцца за дабражадальнікаў і нашэптваюць у вушы няхітраму народу розную ману і абяцанкі, а пасля – па здабыцці таго, што ім трэба, пакажуць свой сапраўдны твар. Ганіце ўсіх, хто робіць замахі на родную мову і школы вашы: моцна стойце на сваім нацыянальным грунце і бараніце тое, чым жыў народ і што дае яму права на духовае існаванне. Усе памятайце, што вы беларусы, што назова гэтая мусіць быць святая кожнаму з нас, якой зрачыся – ёсць зрабіць праступак перад сваім сумленнем і будучыняй дзяцей*"[576].

Узамен за агітацыю сярод суайчыннікаў на карысць латгальскіх хадэкаў П. Журкоўскі быў уключаны ў спіс кандыдатаў іх партыі[577]. На старонках

---

[574] *Мы пачынаем*, "Беларускае слова" 1931, № 1, с. 1.

[575] Выдаўцы газеты заклікалі: "*Нам усім беларусам сялянам трэба ісці аднэй дарогай, аб'еднацца ў адну моцную Хрысціянска-Сялянскую партыю і ў выбарах у Сойм аддаць свае галасы толькі за Хрысціянска-Сялянскую партыю. Ніводнага голасу за прагрэсістаў, сацыял-эмакратаў, палякаў і камуністаў, бо беларускаму сяляніну не па-дарозе з тымі, якія наша жыццё давялі да крытычнага стану*". *Чаму мы ідзём з Латгальскай Хрысьціянска-Сялянскай партыяй*, "Беларускае слова" 1931, № 1, с. 2.

[576] *Беларусы!*, "Беларускае слова" 1931, № 1, с. 1.

[577] *Список Христианских крестья католиков № 9*, "Беларускае слова" 1931, № 2, с. 1.

“Беларускага слова” паўтараліся праграмныя ўстаноўкі латгальскіх клерыкалаў. Газета апублікавала тэзісы партыйнай выбарчай праграмы, дзе дамінавалі лозунгі сацыяльнага (паляпшэнне дабрабыту і асветы сялянаў) і рэлігійна-маральнага характару (рэлігійнае выхаванне і абарона ад бязбожніцтва). Падкрэслівалася неабходнасць павысіць цэны на сельскагаспадарчыя тавары, асушаць багны, будаваць шашу і масты, утвараць хутары, даваць дзяржаўную дапамогу на выпадак неўраджаю, ствараць рамесныя і сельскагаспадарчыя школы, паляпшаць матэрыяльнае становішча настаўнікаў, бараніць правы роднай мовы, інтарэсы Каталіцкай царквы, адкрываць новыя школы, выхоўваць моладзь у каталіцкім духу[578]. У агітацыйнай літаратуры хадэкі перасцерагалі перад “*чырвонымі, якія вядуць вас да жахаў Расіі*”[579], крытыкавалі палітыку сацыял-дэмакратаў, асабліва прагрэсістаў, якіх вінавацілі ў “антыкаталіцкасці” і “бязбожніцтве”, а таксама вядзенні палітыкі, якая прывяла да гаспадарчага заняпаду[580]. Большасць агітацыйных матэрыялаў на старонках “Беларускага слова” друкавалася па-руску, а яго адрасатам былі “сяляне-каталікі”[581]. Калі не лічыць пастулату аб праве латгальскага сялянства вучыць дзетак на роднай мове, у выбарчай праграме практычна не закраналася нацыянальнае пытанне[582].

Група П. Журкоўскага не падтрымлівала прыязных адносін з дзеячамі БДПЛ. Апошнія скептычна ставіліся да супрацоўніцтва з латгальскімі клерыкаламі. Вось як С. Сахараў характарызаваў ініцыятыву П. Журкоўскага: “*Мы, беларусы, павінны былі бы радавацца, што пашыраецца беларускае друкаванае слова і таму трэба было бы вітаць пачынальнікаў гэтае справы. Але гэтага нельга сказаць у вадношанні да газеты ‘Беларускае слова’, нягледзячы на тое, што яе выдае і рэдагуе інспектар беларускіх пачатковых школаў. Па-перш, сам ён сябра не беларускай партыі, а латгальскай, а па-другое, ён прымушан будзе пісаць у сваёй газеце тое, што патрэбна гэтае партыі, а не беларускай нацыянальнай справе. Трэба таксама прыняць пад увагу, што газета гэта, як відаць, з’яўляецца прадвыборчым ‘мыльным пузыром’, бо яна ўзнікла толькі некалькі тыдняў да выбараў, а ў дзень выбараў пэўна знікне. Дык зачым жа Вам, гр. Журкоўскі, марнаваць свае маладыя сілы на той справе, якая не можа даць належнай карысці беларускай нацыянальнай меншасці? Надта павялічаны Вашы летуценні, што быццам пад партыйны сцяг латгальскіх крыстігаў пойдзе беларускае сялянства. Добра і Вы павінны*

---

[578] *Католики! Голосуйте за № 9*, “Беларускае слова” 1931, № 1, с. 3–4.

[579] *Все крестьяне-католики!*, “Беларускае слова” 1931, № 2, с. 1.

[580] А. Пастор, *Как прогрессисты обманывают народ*, “Беларускае слова” 1931, № 2, с. 1–2.

[581] П. Журковский, *Все Крастьяне-Католики*, “Беларускае слова” 1931, № 2, с. 1.

[582] *Католики! Голосуйте за № 9*, “Беларускае слова” 1931, № 1, с. 3–4.

адчуваць, як інспектар беларускі школ, што беларусам патрэбен не гэты сцяг, а родны сцяг беларускай культуры, эканамічнага развіцця бел. нац. меншасці. Мы лічым, што ўваходжаннем беларусаў 'па адзіночцы' ў чужыя партыі, якраз і 'сеецца той нацыянальны раскол сярод беларусаў', аб якім вы кажаце ў сваім артыкуле 'Рознагалоссе ці разыходжанне'. У нас, латвійскіх беларусаў, да таго часу будзе і рознагалоссе, і разыходжанне, пакуль мы ўсе не прыйдзем да адной простай думкі: стаць усім на аб'еднаны дэмакратычна-нацыянальны шлях. Тады мы толькі знойдзем шлях да агульнага супрацоўніцтва, тады мы заслужым пашану з боку латыскіх і латгальскіх партыяў і тады мы сумеем устанавіць кантакт у працы з імі на карысць нашага грамадзянства. Гэту думку Вы, гр. Журкоўскі, займаючы адказную пасаду інспектара беларускіх школ, павінны першым усвоіць і, адкінуўшы служэнне чужой партыі, пакіраваць нашу культурна-нацыянальную справу ў Латвіі па гэтым сапраўдным шляху"[583].

Тым часам П. Журкоўскага падтрымалі некаторыя настаўнікі. Сярод іх знаходзіўся П. Жэрдзі, прадстаўнік таварыства "Прасвета". У сувязі з гэтым кіраўніцтва таварыства адклікала яго з Рады БША выказаўшы вотум недаверу за тое, што без узгаднення з кіраўніцтвам арганізацыі падчас пасяджэння Рады агітаваў за П. Журкоўскага[584]. Беларускую секцыю латгальскіх клерыкалаў належыць лічыць адзіным палітычным прадстаўніцтвам латвійскіх беларусаў правага ўхілу. Узяўшы пад увагу дамінаванне сярод беларускіх дзеячаў левых і крайне левых поглядаў, гэту з'яву можна разглядаць як новую якасць у мясцовым беларускім руху. Удзел П. Журкоўскага не быў выпадковы, гэты дзеяч маладога пакалення быў звязаны з латгальскім каталіцкім рухам і не падзяляў захаплення "левізной" большасці "старых" беларускіх лідараў.

Выбарчая стратэгія латвійскіх беларусаў у 1931 г. адлюстроўвае новыя тэндэнцыі. Па-першае, стварэнне БДПЛ, яе паразуменне з цэнтра-правымі прагрэсістамі, а таксама з'яўленне беларускай секцыі ў складзе Хрысціянска-сялянскай партыі належыць разглядаць як выразны адыход беларускіх дзеячаў ад левых поглядаў. Гэта было прадыктавана зменамі на латвійскай палітычнай сцэне на мяжы 1920-х і 1930-х гг. Па-другое, беларускі актыў адмовіўся ад спроб выстаўляць самастойны нацыянальны выбарчы спіс і пачаў шукаць шчасця ў саюзе з агульналатвійскімі альбо латгальскімі палітычнымі сіламі. Можна пагадзіцца з Кацярынай Казачонак, якая лічыць, што стаўка беларускіх дзеячаў на партыі, што раней не выказвалі падтрымку беларускаму руху – прагрэсістаў і хадэкаў – была з аднаго боку вынікам

---

[583] Дземенскі, *Думкі беларуса аб новай беларускай часопісі*, "Думка беларуса" 1931, № 4, с. 3–4.

[584] LVVA, 2125 f., 5 ap., 24 l., lp. 1.

расчаравання ва ўласных сілах, а з іншага – доказам глыбейшай інтэграцыі беларусаў з латвійскім грамадствам[585].

Як і падчас папярэдніх выбараў, у 1931 г. за галасы беларускамоўных жыхароў Латвіі змагаліся польскія і рускія кандыдаты. Латвійская прэса адзначала, што несвядомыя беларусы лёгка робяцца прадметам выбарчых маніпуляцый рускіх і палякаў, праз што беларускія кандыдаты губляюць галасы[586]. Напярэдадні выбараў у польскай прэсе з'яўляліся матэрыялы, аўтары якіх заклікалі не галасаваць за беларускіх кандыдатаў. У газеце "Dzwon" чытаем: "*У паветах часта палякам гаворыцца, што яны беларусы (…) Гэта хлусня. Беларус – гэта той жа паляк, якому прымусам выдзерлі родную мову і загадалі размаўляць па-расійску, але ў душы ён застаецца палякам. Не слухайце беларускіх агітатараў, ім патрэбны толькі вашыя галасы, каб імі правесці сваіх кандыдатаў, якія, аднак, нягледзячы на абяцанкі, не дадуць і нічога для вас не зробяць*"[587].

3 і 4 кастрычніка 1931 г. адбыліся выбары Сойму IV склікання. Яны не прынеслі поспеху ніводнай беларускай палітычнай групоўцы. Беларускамоўныя жыхары Латгаліі і Земгаліі ў асноўным аддалі галасы агульналатвійскім і латгальскім партыям, часткова рускім і польскім кандыдатам. Літоўска-беларускі спіс у Земгаліі атрымаў толькі 3 105 галасоў, таму не правёў у Сойм ніводнага дэпутата. Пераможцамі ў Земгаліі аказаліся агульналатвійскія партыі (ЛСДРП, прагрэсісты, хадэкі і інш.). У Латгаліі значнага поспеху дасягнулі прагрэсісты (48 795 галасоў)[588]. У цэлым па краіне вынік ППС быў добры, што дазволіла ёй удзельнічаць у дзяржаўным кіраванні. У снежні 1931 г. быў сфарміраваны ўрад прагрэсіста М. Скуеніекса, які абвясціў пра новы курс нацыянальнай палітыкі. Аднак надзеі на тое, што прагрэсісты будуць абараняць правы беларусаў, не спраўдзіліся. Праз эканамічныя цяжкасці латвійскія палітыкі пачалі патрабаваць ад урада скарачэння выдаткаў на культурныя патрэбы нацменаў, вылучэння крэдытаў латышам, абавязковага выкарыстання толькі латышскай мовы ў справаводстве. Міністр асветы Атыс Кеніньш (*Atis Ķeniņš*) ініцыяваў змаганне за адзіную латышскую культуру і абмежаванне школьнай аўтаноміі. У выніку новы ўрад зменшыў субсідыі на патрэбы нацыянальных меншасцей (у тым ліку беларусаў). Прэм'ер абвясціў пра намер прыняць моўны закон, згодна з якім у дзяржаўных установах можна будзе выкарыстоўваць іншую мову толькі ў мясцовасцях,

---

[585] K. Kazachonak, *Cooperation of Latvian Belarusians with the non-belarusian political organizations of Latvia in 1928–1931*, "Nordic and Baltic Studies Review" 2016, № 1, p. 160.

[586] М. Голдманис, *"Белорусский" дискурс в латышской прессе (1920–1934): эволюция представления о белорусах как о самостоятельном национальном меншинстве*, "Латыши и белорусы: вместе сквозь века", Минск 2016, № 5, с. 74.

[587] *Zbliżają się wybory*, "Dzwon" 1931, № 14, s. 1.

[588] *Latvijas Republikas Saeimas vēlēšanas 1931 gadā*, tekst un redakcija M. Skujenieka, Rīgā 1933, s. 18–19.

дзе нацмены складаюць не менш за 20% насельніцтва. Падчас размовы з журналістам газеты "Сегодня" палітык даў зразумець, што ў Латгаліі ёсць людзі з неакрэсленай нацыянальнасцю, з якіх некаторыя палітычныя сілы намагаюцца рабіць беларусаў і палякаў[589].

Прадстаўнікі прагрэсістаў у Сойме не выступілі ў абарону беларускіх школ, што выклікала незадаволенасць беларусаў. Падчас партыйнай нарады Пустынскага аддзела ППС, якая адбылася 11 верасня 1932 г., у адрас сяброў партыі гучалі дакоры. Прадстаўнікі БДПЛ выступілі з пратэстам, звярнуўшы ўвагу на невыкананне абяцанняў дадзеных беларусам напярэдадні выбараў. У выніку аддзел прыняў крытычную рэзалюцыю на адрас ЦК ППС[590]. На шчасце для беларусаў, новая ўрадавая палітыка не атрымала падтрымкі ў Сойме, а 15 чэрвеня 1933 г. міністр асветы быў вымушаны сысці ў адстаўку[591]. Нягледзячы на нацыяналістычныя дэмаршы некаторых палітыкаў, ва ўмовах парламенцкай дэмакратыі нацыянальна-культурнай аўтаноміі нацменаў нічога не пагражала. Ліберальнае заканадаўства і дэмакратычна абраны парламент былі надзейным гарантам захавання правоў нелатышскага насельніцтва[592].

Вынікі выбараў у 1931 г. прадвызначылі далейшы лёс БДПЛ. Партыя была створаная на патрэбы парламенцкай кампаніі, якая аднак не дала чаканага выніку. Няўдалая спроба правесці прадстаўніка ў Сойм азначала адсутнасць перспектыў на шырокую партыйную дзейнасць у будучыні. Не маючы дастаткова грошай, БДПЛ не магла разгарнуць паўнавартую дзейнасць. З прычыны матэрыяльных цяжкасцей партыйны орган "Думка беларуса" таксама праіснаваў нядоўга. Яшчэ перад выбарамі, 26 верасня 1931 г., выйшаў апошні нумар газеты. Паразай скончылася і спроба П. Журкоўскага правесці беларускага дэпутата ў Сойм з дапамогай латгальскіх клерыкалаў. Гэтай партыі ўдалося атрымаць найбольшую колькасць галасоў у Латгаліі (67 413), што дало ажно сем месцаў у Сойме[593]. Але кандыдат-беларус у іх лік не трапіў. Існаванне беларускай секцыі аказалася з'явай часовай, патрэбнай латгальскім клерыкалам толькі каб заручыцца падтрымкай беларускіх каталікоў і, дзякуючы іх галасам, правесці ў парламент сваіх прадстаўнікоў. Неўзабаве пасля выбараў група П. Журкоўскага знікла з палітычнага далягляду.

---

[589] *Biełarusy u Łatwii*, "Беларуская крыніца", № 2 ад 17 студзеня 1930 г., с. 2; *Беларусы ў Латвіі*, "Беларуская крыніца", № 8 ад 22 лютага 1930 г., с. 2.

[590] Мясцовы, *Беларускае жыхарства дамагаецца, каб латгальскія партыі выканалі свае перадвыбарныя абяцанкі*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1932, № 5(15), с. 209.

[591] *История Латвии XX век*, Д. Блейере, И. Бутулис, А. Зунда и др., Рига 2005, с. 203.

[592] P. Łossowski, *Kraje bałtyckie na drodze od demokracji parlamentarnej do dyktatury: 1918–1934*, Wrocław 1972, s. 77.

[593] *Latvijas Republikas Saeimas vēlēšanas 1931 gadā*, tekst un redakcija M. Skujenieka, Rīgā 1933, s. 18–19.

Даўжэйшай аказалася палітычная кар'ера У. Пігулеўскага, які захаваў адданасць сацыял-дэмакратычным поглядам. У 1931 г. беларуса ўжо не было ў выбарчых спісах ЛСДРП, але ў наступныя гады ён паслядоўна працягваў супрацоўнічаць з гэтай партыяй. Апошняя прынамсі на словах дэкларавала абарону правоў нацыянальных меншасцей, што было асабліва істотна для беларусаў перад абліччам узмацнення правых. Пазіцыя сацыял-дэмакратаў у пытанні нацменаў вынікала як з іх супрацьстаяння з палітычнымі апанентамі, так і агулам з стратэгіі ЛСДРП. Праўда, абарона правоў беларусаў ніколі не была прыярытэтам нацыянальнай палітыкі сацыял-дэмакратаў. У складзе партыі існавалі розныя нацыянальныя секцыі: расейская, нямецкая, польская і літоўская. Нешматлікія беларусы–сябры партыі бралі ўдзел у працы рускай секцыі. Толькі ў 1933 г. з'явілася ініцыятыва аформіць беларусаў у асобную нацыянальную адзінку. 26 лістапада 1933 г. на старонках рускамоўнага партыйнага органа "Трудовая мысль" была надрукавана адозва да беларускіх рабочых, сялян і працоўнай інтэлігенцыі з заклікам уступаць у шэрагі ЛСДРП[594]. 13 студзеня 1934 г. была створаная беларуская секцыя ЛСДРП з 11 чал., у тым ліку: У. Пігулеўскі (кіраўнік), Франц Клагіш, Язэп Клагіш, М. Калінін, Я. Яхімовіч і іншыя. У ліку сяброў не было М. Дзямідава, які яшчэ ў 1928 г. пакінуў шэрагі партыі і падчас выбараў 1931 г. не далучыўся да ніводнай палітычнай групоўкі. Нягледзячы на існаванне беларускай секцыі, партыя не выдавала прэсы для беларусаў, тым часам, як прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей (палякі, рускія) мелі сацыял-дэмакратычныя выданні на роднай мове[595].

Выбарчая параза ў 1931 г. не адбіла ў беларускіх дзеячаў жадання ўдзельнічаць у наступных парламенцкіх выбарах, якія меліся адбыцца ў 1934 г. У траўні гэтага года ў віленскай "Беларускай крыніцы" з'явілася зацемка пра праект стварэння беларускай секцыі ў "Латвійскай Каталіцкай Хрысціянскай Дэмакратыі"[596]. Магчыма, меліся на ўвазе колішнія сябры групы П. Журкоўскага. Наяўныя крыніцы не даюць больш інфармацыі пра гэты эпізод. Далейшы ход падзей паказаў, што выбары 1931 г. сталі апошнімі ў гісторыі міжваеннай Латвійскай Рэспублікі.

Якія ж высновы дазваляе зрабіць агляд палітычнай дзейнасці латвійскіх беларусаў? Неаднаразовыя спробы правесці сваіх прадстаўнікоў у Сойм скончыліся паразай (з выключэннем сацыял-дэмакрата У. Пігулеўскага ў 1928 г.). Прычыны няўдач былі розныя. Вялікую шкоду прынесла няздольнасць

---

[594] *У Латвіі*, "Родны край" № 25 ад 16 снежня 1933 г., с. 4–5.

[595] Польская секцыя ЛСДРП выдавала газету "Myśl pracy", якая да 1930 г. выходзіла як дадатак да рускамоўнага выдання "Трудовая мысль", а ў 1930–1934 гг. мела статус самастойнага перыёдыка. Э. Екабсонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [у:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 55.

[596] *Z życcia Biełarusoŭ-Katalikoŭ u Łatwii*, "Беларуская крыніца" № 22 ад 20 траўня 1934 г., с. 2.

беларускіх дзеячаў пераадолець унутраныя разыходжанні і аб'яднацца, каб выступіць адзіным выбарчым фронтам. Неабходна падкрэсліць, што палітычная раздробленасць беларусаў не была чымсьці адметным. Палітычныя падзелы і непаразуменні былі ўласцівыя і іншым нацыянальным групам. Так, у міжваеннай Латвіі дзейнічалі ажно 15 нямецкіх, 9 габрэйскіх і 5 рускіх партый[597]. Расколу не пазбеглі і палякі[598]. Аднак найважнейшай прычынай выбарчых паразаў належыць прызнаць тое, што нацыянальная свядомасць беларускамоўнага насельніцтва Латвіі знаходзілася ў стадыі фарміравання. Патэнцыйны электарат беларускіх кандыдатаў складалі малаадукаваныя незаможныя сяляне і рабочыя, большасць іх абыякава ставілася да нацыянальных каштоўнасцей. Беларускія актывісты мелі сціплыя матэрыяльныя сродкі, каб самастойна весці актыўную палітычную кампанію і эфектыўна канкураваць з непараўнальна лепш забяспечанымі і арганізаванымі сіламі – як агульналатвійскімі, так і нацыянальнымі (латгальскімі, рускімі і польскімі). Таму беларускія палітыкі былі вымушаныя шукаць хаўруснікаў. Характэрнай рысай беларускай палітычнай сцэны ў міжваеннай Латвійскай Рэспубліцы была яе левая арыентацыя. Гэтая акалічнасць не павінна дзівіць, калі ўзяць пад увагу сацыяльна-эканамічную структуру беларускага насельніцтва, сацыялістычны радавод большасці беларускіх дзеячаў і знешнепалітычны фактар (існаванне БССР).

Узаемадачыненні з іншымі нацыянальнымі меншасцямі

Трапна дачыненні беларускага руху з іншымі нацыянальнымі меншасцямі ахарактарызаваў У. Пігулеўскі: з літоўцамі – сяброўскія, з немцамі, габрэямі і стараверамі – мірныя, з палякамі і рускімі – варожыя. На практыцы

---

[597] P. Łossowski, *Kraje bałtyckie na drodze od demokracji parlamentarnej do dyktatury: 1918–1934*, Wrocław 1972, s. 73.

[598] Падчас парламенцкіх выбараў 1931 г. у раней маналітным польскім палітычным лагеры ў Латвіі адбыўся раскол. Акрамя Саюза палякаў у Латвіі (СПЛ) у выбарах узяло ўдзел Польска-каталіцкае таварыства моладзі "Прамень" (спіс № 18) на чале з кс. Баляславам Лаўрыновічам. Новая палітычная групоўка засяроджвалася на рэлігійных лозунгах і акцэнтавала патрэбу супрацы з каталікамі іншых нацыянальнасцей. Святар абвінаваціў кіраўніцтва СПЛ у нелаяльнасці да латвійскай дзяржавы і імкненні паланізаваць латышоў і беларусаў. І хоць спіс кс. Лаўрыновіча не здолеў правесці ў Сойм аніводнага кандыдата (за польска-каталіцкі спіс у Латгаліі прагаласавала 4 157 чал.), ён пазбавіў кандыдатаў СПЛ (№ 12) часткі галасоў. Дзеянні святара выклікалі крытыку ў яго адрас. Ён быў выключаны з СПЛ. E. Ekabsons, *Mniejszość polska w Republice Łotewskiej 1918–1941* [w:] *Polacy na Łotwie*, red. E. Walewander, Lublin 1993, s. 154–155; J. Albin, *Polski ruch narodowy na Łotwie w latach 1919–1940*, Wrocław 1993, s. 80; Idem, *Organizacje polskie na Łotwie w latach międzywojennych* [w:] *Polacy na Łotwie*, red. E. Walewander, Lublin 1993, s. 212–213.

інтарэсы мясцовага беларускага руху перакрыжоўваліся з дзвюма апошнімі нацыянальнымі групамі. Той жа У. Пігулеўскі тлумачыў прычыну варожасці з імі тым, што "*кансерватыўная частка польскіх і вялікарускіх дзеячаў усё яшчэ знаходзіцца пад урокам гістарычных вялікадзяржаўніцкіх традыцыяў, не ў стане прасякнуцца новай ідэалогіяй і пагадзіцца з фактам, што апалячаныя і зрусіфікаваныя беларусы паступова вяртаюцца ў шэрагі свайго народа і тым самым колькасна памяншаюць шэрагі палякаў і вялікарусаў*"[599]. Гэты погляд падзяляў і К. Езавітаў, які даваў больш разгорнуты агляд матываў непрыязнасці палякаў і рускіх да беларускай працы: "*З першых крокаў навастворанаму таварыству і яго кіруючай групе прыйшлося вытрымаць шалёны націск расейскае чорнае сотні і польскіх шавіністычна-абшарніцкіх колаў. У арганізацыі беларусаў і ў стварэнні беларускіх меншасцёвых таварыстваў, як расейскія манархісты, так і польскія шавіністы ўбачылі пагрозу сваім уплывам у Латгаліі, убачылі, што ў іхнюю векавую барацьбу за душы беларускага народа ўступае новая сіла, свядомая беларуская інтэлігенцыя, якая будзе весці змаганне за тое, каб беларусы не зрабіліся ні палякамі, ні расейцамі, а каб трымаліся свайго роднага беларускага. Гэта было моцным ударам – у латвійскім, зразумела, маштабе – па ідэі 'адзінае недзялімае матушкі-Расеі', а таксама не меншым ударам і па польска-памешчыцкай ідэі 'Польшчы ад мора да мора' (...) Вось чаму з абодвух бакоў на беларусаў і іхніх павадыроў пасыпаліся ўсялякія абвінавачванні. І палякі-шавіністы і велікаросы-'недзялімцы' пастанавілі ўжыць усе спосабы, каб спыніць малады беларускі адраджэнчы рух у Латвіі. Паміж двума адвечнымі ворагамі, маскалямі і палякамі, часова наступіла нібыта нейкае перамір'е і нават больш таго – наступальны хаўрус супраць толькі што паўсталае беларускае меншасці*"[600]. Дадзеная ацэнка з'яўляецца прыкладам вельмі эмацыйнага падыходу. Каб зразумець сапраўдныя прычыны і характар канфлікту, належыць падрабязней прааналізаваць беларуска-польскія і беларуска-рускія стасункі ў Латвіі.

Беларуска-польскія адносіны

Зразумець сутнасць беларуска-польскіх узаемадачыненняў у Латвіі немагчыма без ведання гісторыі польскай прысутнасці і гістарычнага шляху польскага руху ў Латвіі. Спачатку апорай мясцовай польскай культуры былі прадстаўнікі шляхты і буйных землеўласніцкіх родаў, якія жылі ў Латгаліі. Аднак у трэцяй чвэрці XIX ст. на беларуска-літоўска-латвійскім памежжы – на паўночным беразе Дзвіны – з'явіліся польскамоўныя вясковыя абшары.

[599] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 56, л. 59.

[600] К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, Рыга 1927 [перадрук: Нью-Ёрк – Менск 2013], с. 53.

Даследчык Пётр Эберхард адзначае, што гэта адбылося пад уплывам каталіцкага духавенства і шляхты, як вынік самапаланізацыі тутэйшага сялянства, што мела латышскае альбо беларускае паходжанне[601]. Можна звярнуцца да ўспамінаў Баляслава Ліманоўскага, які адзначаў, што ў часы яго дзяцінства і юнацтва ў родных мясцінах *"у шляхецкіх дамах гаварылася па-польску і служба з вялікай лёгкасцю прызвычаілася да гэтай мовы"*[602]. Буйным цэнтрам польскай грамадска-культурнай актыўнасці была Рыга. Пазіцыя мясцовай польскай супольнасці была значна аслабленая ў выніку зямельнай рэформы, праведзенай у першыя гады незалежнасці Латвіі. Большая частка буйных польскіх землеўласнікаў была вымушаная выехаць у Польшчу. Тым не менш, у Латвіі засталася польская інтэлігенцыя, якая стварыла ў міжваенай латвійскай дзяржаве шэраг польскіх культурна-асветніцкіх і грамадска-палітычных арганізацый. Найбуйнейшай з іх быў Саюз палякаў у Латвіі (СПЛ), які дзейнічаў у 1922–1931 гг.[603]

На становішча латвійскіх палякаў уплывалі палітычныя адносіны паміж Варшавай і Рыгай. Наогул, польска-латвійскія ўзаемадачыненні ў міжваенны час можна ахарактарызаваць як сяброўскія, хоць і не пазбаўленыя праблем. Адной з галоўных прычын для рознагалоссяў быў статус шасці валасцей Ілукштанскага павета. Спрэчка ўзнікла ў часе змагання Польшчы і Латвіі за незалежнасць. У студзені 1920 г. польскія войскі занялі Ілукшчыну і Латгалію, вызваліўшы ад бальшавікоў. Згодна з загадам Юзафа Пілсудскага, польскі бок перадаў уладу ў Даўгаўпілсе латвійскай дзяржаве, але статус Ілукшчыны быў нявызначаны. Варшава прапанавала вырашыць пытанне дзяржаўнай прыналежнасці спрэчных земляў плебісцытам. Латвійскі бок як слабейшы быў вымушаны пагадзіцца. Аднак 4 ліпеня 1920 г. Чырвоная армія перайшла ў наступ у Беларусі. Пад націскам бальшавікоў польскія аддзелы з Ілукшчыны

---

[601] P. Eberhardt, *Liczebność i rozmieszczenie ludności polskiej na Łotwie*, "Czasopismo Geograficzne" 1997, t. 3–4, s. 288; Idem, *Polska ludność kresowa: rodowód, liczebność, rozmieszczenie*, Warszawa 1998, s. 139.

[602] Ē. Jēkabsons, *Skład narodowościowy mieszkańców 6 gmin powiatu Iłłukształńskiego w XIX–XX w. jako główny powód sporu terytorialnego między Łotwą a Polską w okresie międzywojennym* [w:] *Granice i pogranicza. Historia codzienności i doświadczeń*, t. I, red. Marzena Liedke, Joanna Sadowska, Jan Trynkowski, Białystok 1999, s. 226.

[603] Першыя спробы даследавання сітуацыі мясцовых палякаў рабіліся ўжо ў міжваенны час. Гл.: K. Keller, *Stosunki narodowościowe, społeczne ekonomiczne i na Inflantach Polskich i polityczne w Łatgalii*, Rypin 1920; E. Maliszewski, *Polacy na Łotwie,* Warszawa 1922; J. Różycki, *Polacy na Łotwie*, Warszawa 1930; W. Sworakowski, *Polacy na Łotwie: uwagi o ich liczbie i rozmieszczeniu, składzie wyznaniowym, podziale według płci i wieku, analfabetyzmie i strukturze społeczno-gospodarczej na podstawie łotewskiego spisu ludności 1930 r.*, Warszawa 1934. Сярод сучасных даследаванняў неабходна ўзгадаць: *Polacy na Łotwie*, red. E. Walewander, Lublin 1993; J. Albin, *Polski ruch narodowy na Łotwie w latach 1919–1940*, Wrocław 1994; A. Skrzypek, *Stosunki polsko-łotewskie 1918–1939*, Gdańsk 1997.

адышлі на захад, каб не апынуцца ў акружэнні. Складаную для палякаў сітуацыю выкарысталі ўлады ў Рызе: на іх загад у спрэчныя мясцовасці ўвайшлі латвійскія аддзелы. Восенню 1920 г. польскія войскі зноў наблізіліся да Ілукшчыны. Латвійскі бок асцерагаўся, што палякі вырашаць сілай забраць спрэчную тэрыторыю прасоўваючыся ажно да Дзвіны. Аднак Ю. Пілсудскі не пажадаў уступаць у памежны канфлікт з Латвіяй, бо бачыў у ёй будучага саюзніка, надзвычай патрэбнага Польшчы ў балтыйскім рэгіёне. Прынамсі частка латгальскіх ды ілукштанскіх палякаў была расчараваная і лічыла, што Ю. Пілсудскі зрабіў памылку, адмаўляючыся ад "польскіх земляў" за палітычныя дывідэнды. Гэтых людзей нескладана зразумець: стагоддзямі польскасць дамінавала ў эканамічным, культурным і рэлігійным жыцці Латгаліі ды Ілукшчыны, а цяпер яны апынуліся ў сітуацыі нацыянальнай меншасці. Улады ў Рызе асцерагаліся, каб незадаволенасць не перарасла ў сепаратысцкія дзеянні. Часамі ў мясцовасцях з перавагай альбо значным працэнтам польскага насельніцтва латвійскую ўладу адкрыта ігнаравалі. Таму стаўленне латвійскіх улад да польскай меншасці ў Латгаліі і на Ілукшчыне было неадназначным. З аднаго боку, яны мусілі дазволіць палякам гарантаваную канстытуцыяй нацыянальна-культурную аўтаномію і тым самым падтрымаць добрасуседскія адносіны з Варшавай – важным вайскова-палітычным і эканамічным партнёрам. З іншага боку, халодны палітычны разлік прымушаў латвійскіх палітыкаў стрымана ставіцца да "празмернай" актыўнасці мясцовых палякаў, заўважаючы ў ёй патэнцыйную пагрозу тэрытарыяльнай цэласнасці краіны[604].

Польскія і беларускія актывісты ў Латвіі знаходзіліся ў рознай сітуацыі. Польскія дзеячы выкарыстоўвалі досвед і магчымасці папярэдніх пакаленняў – да пачатку XX ст. у прыбалтыйскіх губернях існавалі моцныя польскія эканамічныя і культурныя ўплывы. Акрамя таго, у адрозненне ад беларусаў, мясцовыя польскія арганізацыі маральна і матэрыяльна падтрымлівала польскай дзяржавай, яна ж давала і дыпламатычную дапамогу, калі адбываліся канфлікты паміж уладамі ў Рызе і тутэйшымі польскімі дзеячамі. Напрыклад, у 1931 г. латвійскія ўлады спынілі дзейнасць Саюза палякаў у Латвіі звінаваціўшы яго дзеячаў у антыдзяржаўных памкненнях. У адказ Польшча выказала пратэст. У выніку ў 1932 г. латвійскія ўлады пагадзіліся зарэгістраваць новую арганізацыю польскай меншасці – Польскае нацыянальнае аб'яднанне ў Латвіі (ПНАЛ), якое дзейнічала да 1934 г.[605]

---

[604] Ē. Jēkabsons, *Skład narodowościowy mieszkańców 6 gmin powiatu iłłuksztańskiego w XIX–XX w. jako główny powód sporu terytorialnego między Łotwą a Polską w okresie międzywojennym* [w:] *Granice i pogranicza. Historia codzienności i doświadczeń*, t. I, red. Marzena Liedke, Joanna Sadowska, Jan Trynkowski, Białystok 1999, s. 226–227, 231.

[605] Ē. Jēkabsons, *Mniejszość polska w Republice Łotewskiej 1918–1939* [w:] *Polacy na Łotwie*, red. E. Walewander, Lublin 1993, s. 156.

Польскія і беларускія дзеячы ў Латвіі знаходзіліся ў сітуацыі зацятага канфлікту інтарэсаў. Абодва бакі мелі адну сацыяльную базу, якая дазваляла ім развівацца і пашыраць кола прыхільнікаў. У сваёй большасці палякі і беларусы ў Латвіі былі аўтахтонным насельніцтвам Латгаліі і Ілукшчыны[606]. Праўда, сацыяльны статус мясцовых палякаў і беларусаў адрозніваўся. Больш за палову першых (58%) складалі гараджане. У дзесяці гарадах Латгаліі і Земгаліі іх было болей як 10% (у Даўгаўпілсе – 20,8%, Краславе – 29,5%, Лудзы – 12%, Грыве – 18,7%, Ілукшце – 29,2%).

Мясцовыя каталікі, якія "размаўлялі ў хаце па беларуску, але ў касцёле маліліся па-польску", сталі аб'ектам культурнай і палітычнай экспансіі польскага і беларускага рухаў. Праблемы тутэйшага сялянства з нацыянальнай самаідэнтыфікацыяй давалі абодвум лагерам шанец змагацца за яго "галасы і душы". Як польскія, так і беларускія дзеячы залічвалі "тутэйшых" каталікоў да свайго народа. Абодва бакі займалі бескампрамісную пазіцыю. Вызначаючы нацыянальную прыналежнасць, кожны з бакоў выкарыстоўваў крытэрыі, якія найбольш адпавядалі яго інтарэсам. Беларускія дзеячы падкрэслівалі моўны фактар, а прычыну адсутнасці ў беларускамоўных каталікоў беларускай самасвядомасці бачылі ў працяглай паланізацыі рэгіёну. У беларускіх публікацыях адзначалася, што палякі зацягвалі ў свае арганізацыі "нацыянальна-несвядомае" беларускае насельніцтва, без якога ў правінцыі не магла б дзейнічаць большасць польскіх таварыстваў[607].

На самай справе моўны крытэрый не з'яўляўся аб'ектыўным падчас вызначэння нацыянальнасці. Напрыклад, падчас перапісу насельніцтва ў 1930 г. ажно 1 198 палякаў (9%) пазначыла беларускую як мову штодзённага ўжытку. Пераважная большасць іх (1 132) пражывала ў Латгаліі. Тым часам, ажно 923 беларусы сцвярджалі, што дома размаўляюць па-польску. Апошняе тлумачылася ростам колькасці мяшаных шлюбаў. У 1925–1932 гг. палякі ажаніліся і вышлі замуж 7 271 разоў, у тым ліку 1 365 (18,8%) шлюбаў былі з рускімі і беларусамі[608].

Да польскага руху адмоўна ставіліся ўсе беларускія дзеячы, незалежна ад палітычных поглядаў. Крытычны погляд на мясцовую польскасць быў характэрны як для сацыялістычнага "Голасу беларуса", так і для хрысціянска-кансерватыўнага "Беларускага слова". Аргументы зводзіліся да сцвярджэння, што палякі

---

[606] Паводле перапісу 1897 г., у Латгаліі налічвалася 30,9 тыс. (6,2%) носьбітаў польскай мовы: у Даўгаўпілскім павеце – 21,7 тыс. (9,1%), у Лудзенскім – 2,7 тыс. (2,2%), у Рэжыцкім – 6,5 тыс. (4,8%). P. Eberhardt, *Polska ludność kresowa: rodowód, liczebność, rozmieszczenie*, Warszawa 1998, s. 140.

[607] *Паланізацыя ў Латвіі*, "Беларускае слова" 1931, № 1, с. 3; Ізабэлінец, *На чым трымаецца 'польскасьць' у Латвіі?*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1927, № 4(2), с. 43–44.

[608] W. Sworakowski, *Polacy na Łotwie: uwagi o ich liczbie i rozmieszczeniu, składzie wyznaniowym, podziale według płci i wieku, analfabetyzmie i strukturze społeczno-gospodarczej na podstawie łotewskiego spisu ludności 1930 r.*, Warszawa 1934, s. 12–13.

ў Латвіі прадстаўленыя нешматлікай групай буйных землеўласнікаў і шляхты. Пры гэтым ігнараваўся факт, што сярод латгальскіх сялян могуць быць палякі. Пункт гледжання беларускіх дзеячаў у гэтай справе яскрава адлюстроўвае пазіцыя К. Езавітава: "*Аказалася, што 'палякаў' у Латгаліі і Ілукшчыне зусім не так ужо многа, а што большасць залічанае да палякаў людназсці з'яўляюцца беларусамі-католікамі, якім польскія паны ды ксяндзы задурылі галаву тым, што – 'калі ты каталік, дык знача – паляк'. Людназсць гэта ніколі ня ведала польскае мовы і нават не разумела яе. Некалькі польскіх малітваў завучвалася на памяць часта-густа без разумення і зместу гэтае малітвы*"[609].

Не менш катэгарычнымі былі дзеячы польскага руху, якія пераконвалі, што "тутэйшыя" каталікі з'яўляюцца палякамі, якія страцілі ідэнтычнасць і мову праз шматгадовую русіфікатарскую палітыку царызму. Стэрэатып, які аўтаматычна атаясамліваў каталіцызм з польскасцю на ўсходніх землях Рэчы Паспалітай, замацаваўся ў свядомасці польскіх эліт яшчэ на мяжы XIX і XX ст.ст.[610] Беларускасць латгальскіх сялян успрымалася польскімі дзеячамі як сінонім "напаўрускасці", як штучная з'ява, вынік русіфікацыі польскага насельніцтва. Асноўным крытэрыем прыналежнасці да польскай нацыянальнасці лічылася веравызнанне, а моўны фактар разглядаўся як вынік прымусовай асіміляцыі. Каб абвергнуць аргументы беларускага боку польскія аўтары звярталі ўвагу на адрознасць гаворак латгальскіх каталікоў ад беларускай літаратурнай мовы. У адным з артыкулаў чытаем: "*Засцянковая польская шляхта, якая асела, у адносінах з навакольным насельніцтвам, а нават паміж сабою, пачала карыстацца беларускай мовай, але сфармаванай на свой польскі лад і цалкам адрознай ад той, на якой выдае сп. Езавітаў свой 'Голас беларуса'. Гэта шляхта, прыняўшы беларускую гаворку ў штодзённым жыцці, ужывае польскай мовы на святы, адчувае і думае шчыра па-польску, у касцёле моліцца з польскай кніжкі і вельмі абураецца калі нехта яе коштам (…) хоча запоўніць дзірку ў беларускай нацыянальнасці*"[611]. У падобным духу выказваўся аўтар іншай зацемкі: "*Як жа лёгка пазнаць паляка з Латгаліі ці Земгаліі. Многія польскай гаворкай карыстаюцца 'на святы', але гэта палякі, а не нейкія там беларусы, як не адзін 'этнограф' хацеў бы. Нос буйны, лоб высокі і знаёмыя вочы перадусім пра іх польскасць сведчаць. Ёсць і такія, што на роднай мове не размаўляюць, аднак адчуваюць сябе палякамі і абражаюцца, калі іх палякамі называць не хочуць*"[612].

---

[609] Кастусёнак, *Кракадзілавы сьлёзы*, "Голас беларуса" 1926, № 35, с. 1.

[610] M. Świechowski, *W. Ks. Litewskie: ziemia i ludność w cyfrach: (tablice)*, Zakopane 1917, s. 18–19.

[611] *Czy po to Batory przywiódł nas nad Dźwinę byśmy powiększali szeregi Białorusinów? Błędy urzędowej statystyki narodowościowej*, "Tygodnik Polski" 1928, № 119, s. 2.

[612] *Zagadnienie polskiej młodzieży robotniczej*, "Nasz Głos" 1934, № 1, s. 8.

Прычым і беларускія, і польскія актывісты падкрэслівалі немясцовыя карані польскасці і беларускасці ў Латгаліі. У працах беларускіх дзеячаў сустракаем сцвярджэнне, што латвійскія беларусы – нашчадкі полацкіх крывічоў. У публікацыях і выказваннях польскіх аўтараў можна трапіць на ўзгадку, што мясцовыя палякі – нашчадкі шляхты, якая прыбыла на Дзвіну з Польшчы ў часы Стэфана Баторыя і пазней[613]. Ніводзін з бакоў не прызнаваў гістарычнага факту, што мясцовыя палякі і беларусы мелі балтыйскае паходжанне і былі вынікам славянізацыі латгальскага насельніцтва.

Падчас змагання за "галасы і душы" тутэйшага нацыянальна несвядомага сялянства як польскія, так і беларускія дзеячы сутыкнуліся з праблемай палітычнай і грамадскай пасіўнасці латгальскай вёскі. Для тутэйшага беларускамоўнага сялянства родная мова ("простая", "мужыцкая") і культура не ўяўлялі значнай каштоўнасці, бо былі пазбаўленыя сацыяльнага прэстыжу. Інакш успрымалася польская мова і культура, якія лічыліся прыкметай прыналежнасці да вышэйшай сферы. Кастусь Езавітаў з сумам прызнаваў: "*Беларускія мяшчане-каталікі знаходзяцца пад польскімі ўплывамі, хварэюць на панства і лічаць сябе палякамі, бо, згодна іхняму разуменню, быць палякам лепш, чым быць 'простым' беларускім селянінам, або рабочым*"[614]. Аднак у падобным духу выказваліся і польскія дзеячы, якія, таксама, мелі праблемы з прыцягненнем на свой бок пасіўнага "тутэйшага" сялянства. Яны крытычна ацэньвалі стан нацыянальнай свядомасці тых, каго залічвалі да палякаў. Паводле назіранняў польскіх дзеячаў, хіба палова латгальскіх палякаў была нацыянальна свядомай, астатнія ж мелі цяжкасці з самаідэнтыфікацыяй. Гэта было настолькі відавочна, што ў некаторых латвійскіх газетах міжваеннага часу латгальцаў называлі "палякамі" ў двукоссі[615]. Мясцовае каталіцкае насельніцтва было зацікаўленае ў адукацыі сваіх дзяцей на польскай мове, захаваннем яе ў касцёле, але слаба гарнулася да працы ў польскіх арганізацыях. Калі сяляне і цікавіліся адукацыяй па-польску, дык падтрымліваць яе матэрыяльна ўжо не імкнуліся. Дзеячы польскага руху бачылі прагал паміж вярхамі і асноўнай масай грамадства. Адзін з іх

---

[613] Дадзенае сцверджанне толькі часткова адпавядала рэчаіснасці ў дачыненні да Ілукштанскага павета. У адрозненні ад Латгаліі, частка палякаў Ілукшчыны мела немясцовы радавод. Гэта былі людзі, якія на мяжы XIX і XX ст.ст. пераехалі сюды з Літвы, Беларусі ці нават Царства Польскага. Ē. Jēkabsons, *Skład narodowościowy mieszkańców 6 gmin powiatu iłłuksztańskiego w XIX–XX w. jako główny powód sporu terytorialnego między Łotwą a Polską w okresie międzywojennym* [w:] *Granice i pogranicza. Historia codzienności i doświadczeń*, t. I, red. Marzena Liedke, Joanna Sadowska, Jan Trynkowski, Białystok 1999, s. 229–230.

[614] К. Езавітаў, *op. cit.,* с. 40.

[615] М. Голдманис, *"Белорусский" дискурс в латышской прессе (1920–1934): эволюция представления о белорусах как о самостоятельном национальном меньшинстве*, "Латыши и белорусы: вместе сквозь века", Минск 2016, № 5, с. 74.

з жалем канстатаваў: "*Палякі ў Латвіі – гэта не свядомы аднародны польскі элемент Заользінскай Сілезіі. Кіраўнікі (ёсць іх, зрэшты, няшмат) могуць казаць з большай альбо меншай слушнасцю аб сітуацыі і патрэбах палякаў, але, на жаль, не могуць казаць ад іх імя. Гэта найслабейшае месца польскіх арганізацый*"[616]. Некаторыя польскія інтэлектуалы (як рыжскі карэспандэнт Ян Цынарскі) лічылі такі стан недапрацоўкай польскай арыстакратыі, якая захоўвала на гэтых землях польскую культуру, але слаба пашырала яе на сялянскія масы[617]. Тым часам Ежы Ружанскі лічыў, што толькі "*інтэнсіўная асветніцкая праца здолее абудзіць у іх польскі дух*"[618]. Ён сцвярджаў, што пасля 1920 г. у Латвіі не хапала польскай інтэлігенцыі, якая магла б пачаць працу сярод шырокіх мас[619].

На старонках прэсы беларускія і польскія дзеячы агітавалі за тое, каб "тутэйшыя" сяляне вызначыліся наконт нацыянальнага паходжання. У адозве польскіх арганізацый чытаем: "*Большасць нас, палякаў, якія даўно аселі ў Латгаліі, размаўляе па-польску так дрэнна, што неаднойчы задумваемся над пытаннем, ці з'яўляемся мы палякамі, а можа, таксама, беларусамі альбо латышамі? На вёсцы, асабліва ва ўсходняй частцы Латгаліі, палякі маюць дзве мовы: адну для касцёла і важнейшых момантаў – лепшую, правільную амаль добрую пальшчызну, а штодзённа 'простую' мову, вельмі падобную да беларускай мовы. Такім чынам, якая ж мова наша родная: польская ці беларуская? (…) Калі ўзяць пад увагу, што палякі ў Латгаліі знаходзяцца далёка ад стрыжня польскага народа і вельмі доўга карыстаюцца гэтай чужой, паўбеларускай мовай, няма нічога дзіўнага, што пачынаюць мець сумневы ў чысціні свайго польскага паходжання. Не адзін з тых нібы беларусаў, які гаворыць 'папросту', захоўвае як найкаштоўнейшую сямейную рэліквію нейкі каралеўскі пергамент, што найлепшым чынам сведчыць пра яго мазурскае паходжанне. Зрэшты, усе гэтыя моўныя даследаванні для сапраўднага акрэслення нацыянальнасці дадзенай асобы маюць другаснае значэнне. Сёння, калі гэтак нізка ў культурным сэнсе размешчаныя народы як чувашы ўжо 'самавызначаюцца', не толькі мова, але і цэласць нацыянальнай адметнасці павінна вырашаць (…) Дык і пры ўсіх сумневах нашых 'беларусаў', г.зн. палякаў, якія дрэнна размаўляюць па-польску, задаём пытанне востра рашуча: кім сябе лічыш – палякам ці маскалём? Бо трэцяе – беларус – гэта лухта і задурванне галавы. Калі ты молішся па-польску, думаеш як паляк, калі лёс польскага народа табе дарагі і блізкі – скажы сабе рашуча, што ты паляк і злучыся з Польшчай*"[620].

---

[616] J. Albin, *Polski ruch narodowy na Łotwie w latach 1919–1940*, Wrocław 1994, s. 27, 28.

[617] J. Albin, *Polski ruch narodowy na Łotwie w latach 1919–1940*, Wrocław 1994, s. 41.

[618] J. Różycki, *op. cit.*, s. 11.

[619] J. Różycki, *op. cit.*, s. 13.

[620] Цыт.: J. Albin, *Polski ruch narodowy…*, s. 27–28.

Дзеля параўнання варта працытаваць беларускую адозву да сялян, выдадзеную ў 1930 г. напярэдадні перапісу насельніцтва: "*Памятайце, што чалавек выракаючыйся і саромячыйся сваёй беларускай нацыянальнасці ёсць здраднік свайго народа! Не мяшайце толькі нацыянальнасць і рэлігію. Ад таго, што ты ходзіш маліца Богу ў царкву, ты не ёсць 'русскій', а ад таго, што ходзіш у касцёл, ты не ёсць 'паляк'. Ці ты каталік, ці праваслаўны, ці нават стараабрадзец, але па нацыянальнасці ты ёсьць беларус і такім павінен застацца. Ня слухай, беларусе, калі табе будзе хто-небудзь напяваць салодкія песні аб тым, каб ты адрокся бы ад сваёй нацыі і назваў бы сябе 'русскім' ці 'поляком', ці яшчэ кім-небудзь. Ты радзіўся беларусам! Твае дзяды і прадзеды былі беларусамі! Ты гутарыш па-беларуску! Ты спяваеш беларускую песню! Таму ты павінен застацца беларусам усюды, дзе б ты ні быў і хто бы цябе ні запытаў. А таму ты, беларус, куды бы лёс цябе не закінуў, павінен у час перапісу запісацца беларусам*"[621].

Істотны ўплыў на польска-беларускае "спаборніцтва" мела пазіцыя латвійскіх улад. У службовай нататцы латвійскай палітычнай паліцыі *Назіранні па тэме польскай агітацыі ў Латгаліі* (15 красавіка 1924 г.) звярталася ўвага на нацыяналістычныя настроі часткі святароў-палякаў і настаўнікаў мясцовых польскіх школ. Апошнія сярод вучняў "хваляць Польшчу і пагарджаюць Латвіяй", а таксама даюць зразумець, што "Латгалія гэта Польскія Інфлянты, таму нельга выключыць, што яна апынецца ў межах польскай дзяржавы"[622]. Паколькі латвійскія ўлады асцерагаліся росту польскай актыўнасці ў паўднёва-ўсходняй частцы краіны, яны былі схільныя падтрымаць беларусаў, якіх разглядалі як супрацьвагу польскім уплывам. Улады былі схільныя залічваць маласвядомае каталіцкае сялянства да беларусаў, а не да палякаў, што адбілася ў выніках першага ўселатвійскага перапісу насельніцтва 1920 г. Нагадаем, паводле іх у межах Латвіі налічвалася 75 630 (4,74%) беларусаў, а палякаў – 54 567 (3,42%). Хітрыкі латвійскай нацыянальнай палітыкі добра разумелі мясцовыя польскія актывісты. Эдвард Малішэўскі сцвярджаў, што перапісчыкі штучна ўвялі "беларускасць", каб зменшыць колькасць палякаў, і, выкарыстоўваючы адміністрацыйны ціск, дамагліся таго, што беларусамі былі запісаны тыя, хто лічыў сябе палякам. Ён сцвярджаў, што палову каталікоў Лудзенскага і Рэжыцкага паветаў, якія былі запісаныя беларусамі, належыць лічыць палякамі[623]. Яго думку падзялялі іншыя польскія інтэлектуалы[624].

---

[621] *Адозва да беларусаў Латвіі*, "Наша доля" 1930, № 2, с. 1.

[622] LVVA, 1632 f., 2 apr., 493 l., 118–119 lpp.

[623] Нам не ўдалося азнаёміцца з арыгіналам працы Э. Малішэўскага, таму звесткі з яе падаюцца паводле прац іншых даследчыкаў. J. Różycki, *op. cit.*, s. 11; K. Zajas, *Nieobecna kultura. Przypadek Inflant Polskich*, Kraków 2008, s. 159.

[624] Ежы Ружыцкі пісаў: "*Належыць адзначыць, што пазіцыя т.зв. беларусаў з'яўляецца прынамсі напалову фікцыйнай. Нібыта беларусы гавораць па-польску і на гэтай мове хочуць*

У звароце да латвійскіх улад польскія дзеячы пратэставалі супраць запісу палякаў беларусамі насуперак іх волі. У дакуменце адзначалася: "*Усе гэтыя інфлянцкія беларусы лічаць сябе палякамі, моляцца па-польску і дамагаюцца польскіх школ для сваіх дзяцей*"[625]. Аўтары меркавалі, што некаторыя польскія сяляне, няўпэўненыя ў сваёй нацыянальнай прыналежнасці, дазвалялі запісваць сябе беларусамі са страху перад прымусовым высяленнем і паліцэйскім перасследам з боку латвійскіх уладаў[626].

З іншага боку, не гучалі пераканаўча і сцвярджэнні прадстаўнікоў польскага боку пра масавы запіс палякаў беларусамі. Насамрэч большасць насельніцтва, запісанага ў 1920 г. беларусамі, не мела трывала сфарміраванага пачуцця нацыянальнай свядомасці і нярэдка дэкларавала прыналежнасць да той ці іншай нацыянальнай групы ў залежнасці ад сітуацыі. Польскія і беларускія дзеячы не былі задаволеныя вынікамі перапісаў насельніцтва і лічылі іх несправядлівымі ў адносінах да ўласнай нацыянальнай групы. Абодва бакі былі схільныя перабольшваць колькасць сваіх суайчыннікаў у Латвіі. На думку супрацоўнікаў польскага пасольства ў Рызе, сапраўдная лічба палякаў у Латвіі вагалася ад 51 тыс. да 85 тыс. Больш за тое, у польскіх крыніцах можна знайсці нават лічбу 95 тыс.[627] Асцярожнейшым у падліках быў Вітольд Сваракоўскі, які пісаў пра латвійскіх беларусаў як пра несвядомых і падатных на асіміляцыю. Адначасова ён прызнаваў, што пасля сканчэння I сусветнай вайны працэс іх асіміляцыі запаволіўся[628].

Вынікі ўсіх наступных пасля 1920 г. перапісаў насельніцтва былі больш выгаднымі для палякаў, чым для беларусаў, што паказвае дадзеная табліца.

вучыцца. Нягледзячы на тое, што паводле перапісу 1920 г. каля 53 тыс. беларусаў знаходзіцца на тэрыторыі Інфлянт, – у 1919/21 беларускіх школ увогуле не было, у 1921/22 было іх створана адразу 46, у 1925 г. іх налічваецца 50, а ў 1929 г. ужо толькі 31. Пры гэтым мовай навучання з'яўляецца руская мова. Але найлепшым сведчаннем істотнага стану гэтай беларускай справы з'яўляюцца выбары ў Сойм. У 1928 г. беларускі спіс не выстаўляўся ўвогуле, а ў папярэдніх выбарах атрымаў толькі 1990 галасоў (...) Акрамя экспрапрыяцыі зямлі, другой праявай антыпольскага курсу была г.зв. беларуская справа. Латвійскі ўрад у супрацьвагу палякам пачаў моцна не толькі падтрымліваць, але наўпрост ствараць беларускі рух, адчыняючы шэраг школаў і ўстановаў, якія павінны выконваць гэтае заданне. Нярэдка здараліся выпадкі, калі ўрадоўцы, праводзячы перапіс насельніцтва, самі кваліфікавалі дадзенага жыхара як беларуса. Пададзеныя на пачатку лічбы, якія пацвярджаюць значныя ваганні колькасці тых беларусаў, ёсць доказам штучнага стварэння гэтай меншасці". J. Różycki, *op. cit.*, s. 5, 8–9.

[625] Цыт. за: J. Albin, *Polski ruch narodowy na Łotwie w latach 1919–1940*, Wrocław 1993, s. 16.

[626] J. Albin, *Polski ruch narodowy na Łotwie w latach 1919–1940*, Wrocław 1993, s. 16.

[627] J. Albin, *Polski ruch narodowy…*, s. 18.

[628] W. Sworakowski, *op. cit.*, s. 6.

Табліца 46. Колькасны склад беларусаў і палякаў паводле перапісаў насельніцтва ў Латвіі

Нацыянальнасць	1920	1925	1930	1935
Беларусы	75 630 (4,74%)	38 010 (2,06%)	36 029 (1,90%)	26 867 (1,38%)
Палякі	54 567 (3,42%)	51 143 (2,77%)	59 374 (3,12%)	48 949 (2,51%)

Крыніца: J. Albin, *Polski ruch narodowy na Łotwie w latach 1919–1940*, Wrocław 1994, s. 12.

Даследаванні латвійскіх дэмографаў пацвярджаюць, што "тутэйшыя" часта пад уплывам польскіх грамадска-культурных і асветных арганізацый дэкларавалі польскую ідэнтычнасць падчас перапісаў. Гэта дазволіла навукоўцам канстатаваць надзвычайную ўстойлівасць польскай супольнасці ва ўмовах асіміляцыі: палякі не толькі захаваліся, але і павялічвалі колькасць за кошт іншых нацыянальных супольнасцей[629]. Аднак не дзейнасць польскіх арганізацый была галоўнай прычынай таго, што беларусаў менела ў статыстыках. Параўнанне вынікаў усеагульных перапісаў 1925, 1930 і 1935 г. паказвае, што змяншэнне колькасці каталікоў-беларусаў суправаджалася перадусім павелічэннем лічбы тых, хто дэкларавaў прыналежнасць да рускай і латышскай нацыянальнасці. Гэта было вынікам натуральнага працэсу дзяржаўнай асіміляцыі, які ў дачыненні да беларусаў адбываўся хутчэй чым сярод іншых нацменаў[630]. Тым часам рост колькасці палякаў навукоўцы тлумачылі значным (другім у краіне) натуральным прыростам сярод прадстаўнікоў гэтай нацыянальнасці[631].

У Латгаліі і на Ілукшчыне, дзе жыла большая частка латвійскіх палякаў, знаходзіліся і месцы кампактнага пражывання беларусаў. Напрыклад, у 1930 г. на Даўгаўпілшчыне было 19,1 тыс. палякаў (9,4%) і 13,5 тыс. беларусаў (6,7%); на Лудзеншчыне – 4,5 тыс. палякаў (5%) і 4,8 тыс. беларусаў (5,3%%); на Рэжыччыне – 5,3 тыс. палякаў (3,7%) і 2,7 тыс. беларусаў (1,8%%). У ліку рэгіёнаў, дзе скрыжоўваліся польскія і беларускія ўплывы, былі Скайсценская, Краслаўская, Пустынская і Капінская воласці Даўгаўпілскага павета. У першых двух колькасную перавагу мелі палякі (адпаведна: 20,4% супраць 17,5% і 13,1% супраць 5,6%), у трэцяй – беларусы (51,4% супраць 19,1%), а ў апошняй суадносіны былі амаль аднолькавымі з нязначнай перавагай беларусаў (10,6% супраць 10,3%). Апрача таго, польска-беларуская мазаіка назіралася

[629] D. Mačiulis, E. Jekabsons, *Lietuviai Latvijos Respublikoje 1918–1940 metais*, Vilnius 2018, s. 286–287.

[630] J. Albin, *Polski ruch narodowy…*, s. 13.

[631] W. Sworakowski, *Polacy w Łotwie. Uwagi o ich liczbie i rozmieszczeniu, składzie wyznaniowym, podziale według płci i wieku, analfabetyzmie i strukturze społeczno-gospodarczej na podstawie łotewskiego spisu ludności 1930 r.*, Warszawa 1934, s. 19, 44.

ў Рунданскай і Пасінскай валасцях Лудзенскага павета, а таксама ў шэрагу валасцей Ілукшчыны. Там у 1930 г. палякі складалі 6,2 тыс. (11,3%), а беларусы 4,9 тыс. (8,9%). На гэтай тэрыторыі падчас перапісаў адзначаўся вялікі адсотак як палякаў (10–30%), так і беларусаў (25–50%). Пры гэтым суадносіны паміж групамі вагаліся на карысць то адных, то другіх[632]. Напрыклад, тычылася гэта Дземанскай воласці, дзе ад 1925 да 1930 гг. лічба беларусаў зменшылася з 39% да 31% жыхароў, а лічба палякаў выросла з 17% да 25%; у Каплаўскай беларусаў паменела з 52% да 31%, а палякаў паболела з 15% да 31%; у Сіленскай беларусаў паменела з 32% да 9%, а палякаў паболела з 2% да 12%. У Курцумскай і Саліенскай валасцях паменела як беларусаў, так і палякаў. Кіраўніцтва Латвійскай статыстычнай управы сцвярджала, што сусветная вайна і першыя пасляваенныя гады спынілі працэс "самапаланізацыі" мясцовых каталікоў, але потым ён зноў аднавіўся[633]. Іншая тэндэнцыя назіралася ў Раўданскай і Калкунскай валасцях Ілукшчыны. У першай у 1925–1930 гг. лічба беларусаў павялічылася з 0,85% да 12,43%, а палякаў паменшылася – з 18,52% да 12,94% [634].

Адной з галоўнай сфер, у якой праяўляліся супярэчнасці паміж беларускімі і польскімі дзеячамі, была школьная справа. Польскі школьны аддзел пачаў працу ў лютым 1921 г., на сем месяцаў раней за беларускі. На працягу 1921–1930 гг. колькасць польскіх пачатковых школ у Латвіі вагалася між 29 і 45. Апрача таго, у краіне дзейнічалі тры польскія гімназіі (у Даўгаўпілсе, Рызе і Рэжыкнэ)[635]. Колькасць вучняў у польскіх школах, як і ў беларускіх, была нестабільная. У 1919–1921 гг. у Латвіі колькасць польскіх пачатковых школ скарацілася, што супала па часе са з'яўленнем беларускіх. Першыя беларускія школы адчыніліся ў Даўгаўпілскім павеце, дзе пераважала каталіцкае насельніцтва і дзе ўжо існавалі польскія школы. Такім чынам, узнікненне і развіццё беларускай школьнай справы адбывалася коштам польскай, паколькі беларускія школы з'яўляліся натуральнымі канкурэнтамі польскіх[636]. Палякі бачылі ў гэтым "*выключна антыпольскі кірунак, якія рэпрэзентаваў першы латвійскі сойм у галіне ўнутранай і замежнай палітыкі*"[637].

Паміж беларускімі і польскімі дзеячамі ішло змаганне за нацыянальныя школы, калі кожны з бакоў імкнуўся ахапіць сеткай сваіх школ як мага большую

---

[632] *Treša tautas skaitišana Latvijā 1930. gadā*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1930, s. 109; W. Sworakowski, *Polacy w Łotwie*, s. 26–27; К. Езавітаў, с. 38–39.

[633] *Treša tautas skaitišana Latvijā 1930. gadā*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1930, s. 94.

[634] *Treša tautas skaitišana Latvijā 1930. gadā*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1930, s. 109.

[635] J. Albin, *Organizacje polskie…*, s. 210.

[636] LVVA, 2125 f., 5 ap., 66 l., 27 lp.

[637] J. Różycki, *op. cit.*, s. 18.

колькасць мясцовай моладзі. Яскравым прыкладам такой барацьбы быў выпадак, які тычыўся школы ў Пасіене. На пачатку 1920/1921 гг. у гэтай мясцовасці была адчыненая польская школа. Гэта выклікала занепакоенасць мясцовых беларускіх дзеячаў, у выніку іх пратэстаў была створаная камісія па вызначэнні нацыянальнага складу вучняў. Камісія вызначыла (21–22 лістапада 1920 г.), што сярод 300 вучняў толькі адна дзяўчынка ўмела размаўляць па-польску, астатнія карысталіся мясцовай беларускай гаворкай. У выніку 14 снежня 1920 г. рашэннем Лудзенскай павятовай школьнай управы польская школа ў Пасіене была зачынена. На гэтым, аднак, справа не скончылася. Вяртання польскай школы патрабавала мясцовае каталіцкае духавенства і прадстаўнікі польскай грамадскасці, якія звярнуліся ў Польскі школьны аддзел. Апошні 16 чэрвеня 1921 г. звярнуўся з адпаведным лістом да міністра асветы. Сваю пазіцыю польскія дзеячы падмацавалі спісам вучняў, якія жадалі наведваць польскую школу. Мясцовая школьная ўправа зноў стварыла камісію, каб вызначыць нацыянальны склад вучнёўскай моладзі ў Пасіенскай воласці. У выніку ў 29 вёсках налічылі толькі 108 палякаў. Найбольш (87 чал.) налічыў сябра камісіі, які прадстаўляў польскі бок. Аднак нават ён сцвярджаў, што сяляне нярэдка вагаліся, адказваючы на пытанне пра сваю нацыянальнасць. 27 верасня 1921 г. на пасяджэнні Лудзенскай павятовай школьнай управы большасцю галасоў (5 супраць 1) было вырашана адчыніць у мястэчку польскую школу[638].

Гэта выклікала абурэнне беларускага актыву. 29 верасня 1921 г. Лудзенскі аддзел таварыства "Бацькаўшчына" прызнаў недапушчальным адкрыццё польскай школы сярод беларускага каталіцкага жыхарства, гэта разглядалася як праява "каланізацыі беларусаў". На пачатку кастрычніка 1921 г. кіраўніцтва таварыства "Бацькаўшчына" падрыхтавала пратэст на імя міністра асветы. У ім сцвярджалася, што польскія ўплывы ў Пасіенскай воласці з'яўляюцца штучнымі, а польская школа з'явілася праз няведанне павятовай школьнай управай мясцовай сітуацыі. У дакуменце чытаем: "*У Пасіенскай воласці спрадвеку жывуць беларусы. Польскае пытанне ўзнікла толькі таму, што польская мова пануе ў рэлігійным жыцці. У сувязі з гэтым сцвярджалася, што польская школа можа існаваць толькі ў выпадку, калі асвета мае быць канфесійнай і служыць патрэбам царквы. Калі ж школа павінна быць вольнай ад канфесійных ідэяў, дык установы школы на чужой мове (у дадзеным выпадку польскай) супярэчаць арт. 40 закона аб асветных установах Латвіі, дзе школам мовай выкладання з'яўляецца латышская мова (адпаведна для Пасіене – беларуская) (...) Польскі ўплыў у Пасіене падтрымліваецца толькі царквой і асобнымі прадстаўнікамі і з'яўляецца штучным*"[639].

---

[638] LVVA, 2125 f., 5 ap., 68 l., 1–2 lpp.

[639] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 43, л. 1–2; LVVA, 2125 f., 5 ap., 68 l., 1–2 lpp.

З падачы беларусаў 15 лістапада 1921 г. Лудзенская павятовая школьная ўправа зноў занялася справай польскай школы ў Пасіене. Прадстаўнік беларускага настаўніцтва М. Іваноў на пасяджэнні ўправы прапанаваў зачыніць польскую школу. У выніку чарговы раз была створана камісія дзеля вызначэння нацыянальнага складу вучняў. 17 лістапада 1921 г. мясцовы польскі актывіст А. Годэль-Гадлеўскі накіраваў ліст у Польскі школьны аддзел, падзяліўшыся трывогай, што вышэйзгаданая камісія будзе кіравацца вынікамі нявыгаднага палякам перапісу 1920 г. і справа скончыцца закрыццём польскай школы і адкрыццём беларускай[640]. Пратэст супраць ліквідацыі польскай школы падрыхтавалі і іншыя прадстаўнікі польскай супольнасці ў Пасіене[641]. Урэшце беларусы не дамагліся ліквідацыі польскай школы ў Пасіене, але іх дзеянні стваралі істотную перашкоду ў функцыянаванні польскіх школ і абмяжоўвалі магчымасці іх пашырэння.

Беларускія школы змагаліся з польскімі не толькі за вучняў пачатковых школ, але таксама і гімназій. Так, выхаванцы польскіх пачатковых школ паступалі ў беларускія гімназіі. Вучаніца Лудзенскай беларускай гімназіі Сабіна Мяжэцкая ў сачыненні *Як я хачу пабудаваць будучыню* пісала: "*Калі мне быў восьмы год, мама вучыла мяне чытаць па-польску, бо ў нас яшчэ і цяпер цягнецца такій звычай, што перад тым, як ісці ў школу, трэба ўмець чытаць 'па-свойму', па-польску*"[642]. Тым часам селянін Гаўрыла Мяжэцкі ў звароце да дырэктара Даўгаўпілскай беларускай гімназіі пісаў, што ён і яго жонка Анастасія па нацыянальнасці беларусы, пра што сведчаць дакументы выдадзеныя Пасіенскай валасной управай. Ён прасіў, каб і іх дачку, вучаніцу гімназіі Феліцыю, лічылі не полькай, а беларускай. Бацька адзначаў, што ў яе пашпарце, выдадзеным валасной управай, была зробленая памылка: замест беларускай запісаная польская нацыянальнасць. Селянін тлумачыў гэта тым, што да паступлення ў Даўгаўпілскую беларускую гімназію Феліцыя Мяжэцкая скончыла польскую пачатковую школу ў Пасіене[643].

Бацькі вучняў беларускіх школ у мясцовасцях з каталіцкім насельніцтвам часам прасілі ўвесці польскую мову як дадатковы прадмет[644]. Заканадаўства давала такую магчымасць – 10 снежня 1921 г. міністр асветы Латвіі дазволіў выкладанне польскай мовы як неабавязковага прадмета ў школах у мясцовасцях з каталіцкім жыхарствам. Заняткі дазваляліся ад 3-га класа ў аб'ёме

---

[640] LVVA, 2125 f., 3 ap., 49 l., 40 lp.

[641] LVVA, 2125 f., 3 ap., 49 l., 7 lp.

[642] LVVA, 4932 f., 1 ap., 625 l., 68 lp.

[643] LVVA, 2067 f., 1 ap., 402 l., 84 lp.

[644] Сход бацькоў Залескай беларускай школы ў лістападзе 1921 г. вырашыў звярнуцца ў БША з просьбай увесці заняткі польскай мовы, абгрунтоўваючы гэта тым, што сярод 72 вучняў ажно 59 каталікоў-беларусаў. LVVA, 2125 f., 5 ap., 230 l., 10 lp.

дзвюх гадзін на тыдзень[645]. У снежні 1921 г. з адпаведнай заявай у Беларускі школьны аддзел звярнуліся бацькі вучняў Бяляўскай школы ў Пасіенскай воласці[646]. БША пагадзіўся ўвесці заняткі па польскай мове, пачынаючы з 3-га класа (калі бацькі жадалі польскай мовы ў малодшых класах, яны павінны былі гэта абгрунтаваць.) Кіраўніцтва БША не супярэчыла, каб вывучэнне Закону Божага для вучняў-каталікоў ішло па-польску. Адначасова, яно нагадвала бацькам, што "*для Бога ўсе мовы роўныя і незаганна маліцца Богу на сваёй роднай беларускай мове*"[647].

3 лістапада 1921 г. бацькоўскі сход Шушкаўскай школы ўхваліў пераход навучальнай установы ў падпарадкаванне Беларускага школьнага аддзела, але прасіў увесці польскую мову як дадатковы прадмет, бо пераважную большасць вучняў складалі каталікі. Бацькоўскі сход сцвердзіў, што польская мова неабходная ў школе, каб захаваць належны ўзровень рэлігійнага выхавання моладзі[648]. 14 лістапада 1922 г. бацькоўскі сход школы запатрабаваў увесці польскую мову з падрыхтоўчага класа[649].

Падобны выпадак адбыўся ў Талаеўскай школе, дзе 18 лістапада 1923 г. бацькі выказаліся за ўвядзенне польскай мовы. Пры гэтым некаторыя пагражалі, што ў выпадку адмовы перавядуць дзяцей у польскую школу ў Індрыцы. Пратакол сходу сведчыць, што меркаванні ўдзельнікаў падзяліліся, не было згоды і сярод настаўнікаў. У хуткім часе высветлілася, што частка подпісаў пад зваротам бацькоў наконт увядзення польскай мовы была падробленая[650].

29 лістапада 1923 г. настаўніца Талаеўскай школы Люцыя Габран інфармавала БША, што некаторыя бацькі патрабуюць замяніць прадмет "беларуская мова" польскай мовай. Настаўніца пісала: "*Пасля таго, як разабралі павестку дня, мы, вучыцялі, запыталіся бацькоў, ці не маюць якіх пытанняў. Раздаліся галасы: 'Замест беларускай мовы просім у падгатаваўчай кл. прападаваць польскую, каб дзеці нашы ўмелі Богу маліцца. У Сталятах адмянілі бел. мову'. Гэта было так неспадзявана, што мы адразу не знайшлі што сказаць (...) Потым шмат гаварылася ў гэтым напрамку (...) Праўда, ёсць, асабліва ў нашай вёсцы, якія не процiў бел. мовы, але меншасць, і не ўсе з гэтай меншасці былі на сабранні. У суседняй вёсцы ёсць 2 сям'і палякаў, якія падгаварылі з той і суседняй вёскі, кажучы: 'У Сталятах на просьбу бацькоў адмянілі бел. мову, значыць, і тут можна'*"[651]. Настаўніца прасіла

[645] LVVA, 2125 f., 5 ap., 93 l., 2 lp.
[646] LVVA, f. 2125, apr. 5, l. 109, 6 lp.
[647] LVVA, 2125 f., 5 ap., 216 l., 40 lp.
[648] LVVA, 2125 f., 5 apr., 214 l., 9 lp.
[649] LVVA, 2125 f., 5 apr., 214 l., 15 lp.
[650] LVVA, 2125 f., 5 ap., 216 l., 68 lp.
[651] LVVA, 2125 f., 5 ap., 216 l., 29 lp.

Беларускі школьны аддзел забяспечыць яе інструкцыяй, як адказваць бацькам у такіх выпадках. Адначасова, каб змяніць настроі, настаўніца прапанавала зладзіць для вяскоўцаў беларускія імпрэзы і арганізаваць экскурсію вучняў у Даўгаўпілс, каб паказаць ім беларускую гімназію. Прапанову педагог абгрунтоўвала наступным чынам: "*Між іншым, ім* [бацькам – ЕГ] *гаварылася, што ёсць не толькі пач.[атковыя] школы, але і гімназіі ў Польшчы, Латвіі, Расеі. Некаторыя казалі: 'А хто іх бачыў!' У мяне з'явілася мысль, каб была магчымасць, завезці дзяцей у Дзвінск, пайсці ў бел. асн.[оўную] школу, гімназію. Паглядзець будынка, парадку і т.д. Яшчэ ляпей, каб паказаць дзіцячы спектакль ці тож на ёлку (толькі не раней Крашчэнія), каб аддзел мог дапамагчы ў грашовай справе на чалавек 20*"[652].

Кіраўніцтва БША прыслухалася да парады і ў снежні 1923 г. зладзіла экскурсію вучняў вясковых школ у Даўгаўпілс[653]. Акрамя таго, ідучы насустрач патрабаванням бацькоў, 7 снежня 1923 г. Беларускі школьны аддзел інфармаваў: "*Гр. Кіраўніку Талаеўскае беларускае пачатковае школы. На пастанову бацькоў ад 18.XII.23. аб увядзенні польскае мовы ў падгатовачнай класе, Беларускае Упраўленне просіць Вас паведаміць бацькоў аб гэтым: 1) польская мова згодна распараджэнню Міністэрства Прасветы як неабавязковы прадмет можа выкладацца толькі з III класы. 2) Калі патрэбна па думцы бацькоў выкладанне польскае мовы для іх дзетак раней, то для гэтага трэба азначыць тыя матывы, якія вымушаюць гэта рабіць. Калі вымаганне гэта звязана з рэлігіяй, дык нічога нельга мець, каб ксёндз ці хто выкладаў рэлігію, знаёміў дзетак і раней з польскай мовай на лекцыях рэлігіі без змены другіх лекцый. 3) Беларускае Упраўленне не можа згадзіцца з тым, каб у падгатовачнай класе не было беларускай мовы і каб быў зменены расклад лекцый, зацверджаны Міністрам Прасветы*"[654].

З пратакола педагагічнай рады Зілупскай школы (14 лістапада 1922 г.) вынікала, што стаўленне многіх бацькоў-каталікоў да беларускай мовы было варожым, яны патрабавалі заняткаў па польскай мове. Каб пазбегнуць канфліктаў паміж школай і бацькамі, кіраўніцтва БША бачыла патрэбу даслаць у школу настаўніка беларускай і польскай моваў, найлепей каталіка – гэта дапаможа яму заручыцца даверам бацькоў[655].

Каб адвесці бацькоў-каталікоў ад думкі пра перавод школ у падпарадкаванне Польскага школьнага аддзела, беларускі актыў быў вымушаны ісці насустрач патрабаванням пра павелічэнне колькасці гадзін выкладання польскай мовы. 15 лістапада 1922 г. бацькоўскі сход Шнекаўскай школы

---

652 LVVA, 2125 f., 5 ap., 216 l., 29 lp.

653 LVVA, 2125 f., 5 ap., 216 l., 30 lp.

654 LVVA, 2125 f., 5 apr., l. 212, 33 lp.

655 LVVA, 2125 f., 5 ap., 232 l., 12 lp.

ўхваліў выкладанне гэтага прадмета ў падрыхтоўчым класе, дзе датуль выкладалася толькі беларуская мова лацінкай. Разам з тым, бацькі пагадзіліся, каб іншыя прадметы вывучаліся па-беларуску (28 чал. было за, 7 супраць і 3 устрымаліся)[656].

У лісце (23 лістапада 1923 г.) К. Езавітаву справавод БША Я. Шчорс пісаў: "*Ці можа адчыненне беларускіх школ зменшыць польскі ўплыў, дык па наглядах да цяперашняга часу знаходжу, што ў Люцынскім павеце гэта не дасягнута. Прымусовым навучаннем беларускай мовы надта незадаволены бацькі і замест гэтага вымагаюць павелічэння выкладання польскае мовы за кошт беларускае, матывіруючы, што Польшча вялікая дзяржава, што польская мова патрэбна ў касцёле, у той час, калі з беларускай мовай яны звонку мяжы сваёй гміны не могуць карыстацца. Гэты непаспех беларускае мовы тлумачыцца, па-першае, тым, што на месцах няма беларускага нацыянальнага руху, па-другое, можа быць і тым, што ў беларускіх школах вялікі % вучыцялёў велікарусаў, якія не спачуваюць беларускаму руху. Без гэтага, як ужо памянута, надта ўпорчывы адпор дае польскі касцёльны парадак*"[657].

Аналіз вышэйзгаданых сітуацый дазваляе меркаваць, што беларускамоўныя сяляне-каталікі былі моцна прывязаныя да польскай мовы, якая ў іх успрыманні па-ранейшаму мела высокі сацыяльны статус. Яны былі не супраць, каб іх дзеці наведвалі школы, якія знаходзіліся ў падпарадкаванні Беларускага школьнага аддзела, але пры ўмове прынамсі частковай прысутнасці там польскай мовы. БША быў вымушаны шукаць кампрамісу з бацькамі і дазваляць, каб у беларускіх школах вывучалі польскую мову як дадатковы прадмет, а нават паступова павялічвалі колькасці гадзін яе вывучэння. Беларускія дзеячы лічылі гэта вымушаным крокам, каб захаваць беларускія школы ў каталіцкіх рэгіёнах.

Увядзенне польскай мовы як дадатковага прадмета ў беларускіх школах не спыніла канфлікты паміж беларусамі і палякамі на школьнай глебе. Абодва бакі спрабавалі ўзаемна перашкодзіць стварэнню і дзейнасці школ канкурэнта. Польскія і беларускія дзеячы падмацоўвалі права на адкрыццё сваіх нацыянальных школ калектыўнымі заявамі жыхароў. Ініцыятарамі выступалі прадстаўнікі мясцовай інтэлігенцыі (настаўнікі ці святары), якія ўплывалі на настроі часта непісьменнага сялянства. 19 сакавіка 1922 г. жыхары шэрагу вёсак Пасіенскай воласці звярнуліся з петыцыяй у Польскі школьны аддзел: "*Жадаючы мець школу на роднай мове ў вёсцы Шушкава, жыхары вышэйпералічаных вёсак, вельмі просяць аддзел адчыніць у нас у в. Шушкава польскую школу. Замест беларасійскай школы, якая ёсць зараз. У вышэйпералічаных школах колькасць польскіх дзяцей складае звыш ста асоб, тым часам, як*

[656] LVVA, 2125 f., 5 ap., 213 l., 8 lp.

[657] LVVA, 2125 f., 5 apr., 40 l., 123 lp.

няма ніводнага беларуса. Найбліжэйшая нам польская школа знаходзіцца на адлегласці адзінаццаці вёрст у м. Пасіні, у выніку чаго наша дзятва была вымушаная наведваць беларасійскую школу ў м. Шушкава"[658].

Заслугоўвае ўвагі і выпадак Кокінскай беларускай школы на Даўгаўпілшчыне. Паводле звестак БША, нацыянальны склад тамтэйшых вучняў быў наступны: 46 беларусаў, 19 палякаў і 6 літоўцаў. Каб захаваць парытэт, навучанне адбывалася ў двух камплектах, беларускім і польскім. Аднак 9 лістапада 1921 г. бацькоўскі сход вырашыў, што школа павінна быць польскай, але з беларускай мовай у якасці дадатковага прадмета[659]. Змену ініцыявала дырэктарка, полька Леакадзія Банікевіч. Бацькі-беларусы 9 лістапада апратэставалі яе дзеянні. Нягледзячы на гэта, пад уплывам Л. Банікевіч 12 лістапада 1922 г. бацькоўскі сход вырашыў, што ўсе бацькі лічаць сябе палякамі як паводле пашпарту, так і паводле перакананняў і жадаюць, каб іх дзеці вучыліся па-польску, а беларуская мова была выключана з навучання[660]. Кіруючыся афіцыйнай статыстыкай, 3 снежня 1921 г. Даўгаўпілская павятовая школьная ўправа пакінула школу ў падпарадкаванні Беларускага школьнага аддзела. Рашэнне выклікала незадаволенасць кіраўніцы школы, якая лічыла, што беларуская мова выкладаецца насуперак волі бацькоў вучняў. Атаясамліваючы каталіцтва з польскасцю, яна сцвярджала, што сапраўдная колькасць вучняў-палякаў значна большая за афіцыйную. Аднак кіраўнік БША 6 снежня 1921 г. не прыняў гэтага пад увагу, спасылаючыся на недастатковую аргументацыю настаўніцы. Кіраўніцтва Беларускага школьнага аддзела палічылі недарэчным патрабаванне бацькоў-беларусаў, каб іх дзеці навучаліся па-польску, бо гэта супярэчыла латвійскаму заканадаўству пра нацыянальна-культурную аўтаномію нацменаў. У адказе звярталася ўвага і на недапушчальнасць вызначэння польскай нацыянальнасці на падставе каталіцкага веравызнання[661].

Беларускі школьны аддзел (19 снежня 1921 г.) звярнуўся ў Даўгаўпілскую школьную ўправу з прапановай ліквідаваць польскі школьны камплект, які колькасна не адпавядаў патрабаванням. Кіраўнік БША звяртаў увагу, што існаванне польскага камплекта пры беларускай школе "*можа стварыць неблагапрыятную атмасферу для навучання дзяцей*"[662]. Сяргей Сахараў прапанаваў далучыць польскі камплект да беларускага альбо перавесці дзяцей-палякаў у іншую школу. У выніку школа засталася беларускай, аднак "польская праблема" ў яе мурах цалкам не знікла. Сведчыць пра гэта факт,

---

[658] LVVA, 2125 f., 5 ap., 29 l., 42 lp.

[659] LVVA, 2125 f., 5 ap., 142 l., 3 lp.

[660] LVVA, 2125 f., 5 ap., 142 l., 16 lp.

[661] LVVA, 2125 f., 5 ap., 142 l., 4 lp.

[662] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 45, л. 26–27.

што 6 снежня 1930 г. бацькоўскі сход школы прасіў БША ўвесці штодзённыя заняткі польскай мовы[663].

Беларускі бок вінаваціў польскіх дзеячаў у падбухторванні мясцовых улад да рэпрэсій супраць беларускага актыву, перадусім настаўніцтва. 15 снежня 1926 г. кіраўніцтва БША скардзілася МУС на дзеянні паліцыі ў Пасіенскай воласці. Гаворка ішла пра прымусовае высяленне з памежнай зоны настаўніка Язэпа Клагіша і яго брата Даната Клагіша, якіх абвінавачвалі ў сувязях з БССР. Падчас допыту браты адмаўлялі абвінавачанне ў частых кантактах з савецкімі грамадзянамі падкрэсліваючы, што абмяжоўваліся рэдкімі зносінамі са сваякамі, якія жылі на савецкім баку мяжы. На думку кіраўніка Беларускага школьнага аддзела, сапраўднай прычынай высялення была актыўнасць Клагішаў у беларускім руху. У звароце адзначалася, што іх беларускасць выклікае раздражненне мясцовай "польскай шляхты". А тая робіць усё, каб дыскрэдытаваць у вачах мясцовых улад людзей, якія не хаваюць сваёй беларускасці. Кіраўнік БША лічыў, што належала пакінуць братоў Клагішаў у спакоі альбо, калі ў паліцыі ёсць доказы іх віны, пачаць следства. Адначасова сцвярджалася, што на Пасіеншчыне назіраецца польская актыўнасць, якая мае на мэце ліквідацыю беларускіх школ[664].

Варта прывесці яшчэ адзін прыклад беларуска-польскіх непаразуменняў у школьнай сферы. 24 лістапада 1927 г. на пасяджэнні Пустынскай валасной рады было разгледжана пытанне пра ліквідацыю Круманаўскай беларускай школы і перадачу яе будынка мясцовай польскай школе. 26 лістапада 1927 г. пытанне абмеркавала школьная рада. Настаўнікі і бацькі падкрэслілі, што, насуперак сцвярджэнням польскіх дзеячаў, у школе налічвалася не 13, а 31 вучань. Сябры рады лічылі патрабаванні палякаў беспадстаўнымі і патрабавалі прыцягнуць ініцыятараў ліквідацыі школы да судовай адказнасці[665]. У школе існаваў польскі камплект, гэта дазваляе меркаваць, што польскі бок хацеў далучыць яго да сваёй школы[666].

Цікавы выпадак адбыўся ў Плейкаўскай беларускай школе. 10 кастрычніка 1929 г. Інспектар Я. Кастылюк пісаў кіраўніцтву таварыства "Беларуская хата": "*У раёне Плейкаўскае беларускае пачатковае школы адчынілася прыватная польская школа, якая пераманьвае да сябе вучняў нашай школы. Ужо перайшло каля 20 вучняў, але 8 з іх вярнулася назад, калі даведаліся, што ў школе будуць выдавацца гарачыя заўтракі*"[667]. У лістападзе 1929 г. дзеячы СПЛ пачалі старацца пра адкрыццё ў суседняй вёсцы Зарнішкі польскай

[663] LVVA, 2125 f., 5 ap., 142 l., lp. 48.
[664] LVVA, 1632 f., 2 apr., 493 l., 2–3 lpp.
[665] LVVA, 2125 f., 5 ap., 148 l., 13 lp.
[666] LVVA, 2125 f., 5 ap., 148 l., 29 lp.
[667] LVVA, 2924 f., 1 apr., 83 l., 26 lp.

школы. З гэтай мэтай палякі агітавалі бацькоў, дзеці якіх наведвалі беларускую школу. Гэта выклікала абурэнне кіраўніка апошняй Віктара Вальтара, які ў якасці "прэзідыума" пачаў збіраць подпісы бацькоў за захаванне беларускай школы. З яго ініцыятывы 24 лістапада 1929 г. быў скліканы бацькоўскі сход, на якім адбылася спрэчка паміж бацькамі – прыхільнікамі беларускай і польскай школы. У выніку быў выпрацаваны кампраміс. Сход ухваліў рэзалюцыю (23 галасамі – за і 3 – супраць), у адпаведнасці з якой бацькі працягвалі пасылаць дзяцей у беларускую школу, але пры ўмове, што ў ёй тры гадзіны на тыдзень будзе вывучацца польская мова. Акрамя таго, дырэктар беларускай школы неафіцыйна дамовіўся з бацькамі, што забяспечыць вучняў абуткам. Ён звярнуўся ў БША з просьбай выдаткаваць 60 латаў, бо "*той, хто дастае абутак, не мае права пакінуць школу*". Віктар Вальтар у звароце да інспектара беларускіх школ (24 лістапада 1929 г.) падкрэсліваў, што трэба ўсімі сродкамі не дапусціць адкрыцця польскай школы. Пры гэтым ён лічыў непажаданым прыезд камісіі, бо не спрыялі гэтаму настроі сярод бацькоў. У лісце чытаем: "*Камісію высылаць на месца страшнавата, бо бацькі варожа настроены да беларусаў. Ёсць свядомых 3–4 чалавекі, якія, праўда, маглі б перад камісіяй падтрымаць беларускую справу, але яны каплі ў варожым моры. Думаю, аднак, што справа адчынення польскай школы ў Зарнішках у гэтым годзе павінна правaліцца, калі мы аб гэтым парупімся*"[668]. Адначасова В. Вальтар прасіў перавесці яго ў іншую школу матывуючы гэта тым, што сваркі з палякамі падрываюць яго здароўе. У лісце да кіраўніцтва БША ён пісаў: "*Дзеля гэтай барацьбы, якая патрабуе шмат здароўя і моцных нерваў, я больш вытрымаць не магу, а на мяне лажыцца ў значнай меры пляма правалу школы, прашу Вас на маё месца назначыць якую-небудзь самую выдатную сілу беларускую, якая магла бы весці барацьбу з палякамі*"[669].

У рэшце рэшт беларусам удалося абараніць Плейкаўскую школу. Аднак пагроза яе страты не мінула. Новая дырэктарка Ганна Булаўская ў траўні 1930 г. інфармавала інспектара беларускіх школ, што "*вясной і ўлетку будзе вялікая праца палякаў сярод бацькоў-беларусаў, і таму вельмі патрэбна было б не заставіць школу без надзору і свайго ўплыву*"[670]. 17 лістапада 1930 г. настаўніца пісала ў БША: "*Гэтым паведамляю, што Плейкаўская школа знаходзіцца зараз у цяжкіх абставінах. Польская прыватная школа ў в. Зарнішкі дае полудзень вучням і вучні бягуць з маёй школы. Вельмі прашу звярнуць увагу і даць хоць маленькую дапамогу на абед*"[671].

---

[668] LVVA, 2125 f., 5 apr., 175 l., 26–27 lpp.

[669] LVVA, 2125 f., 5 apr., 175 l., 27 lp.

[670] LVVA, 2125 f., 5 apr., 175 l., 37 lp.

[671] LVVA, 2125 f., 5 ap., 175 l., 41 lp.

З вышэйпададзеных прыкладаў вынікае, што не толькі нізкі сацыяльны статус беларускай мовы з'яўляўся слабым месцам у змаганні з палякамі. Праблемай беларусаў з'яўлялася кепская матэрыяльная забяспечанасць беларускіх школ, якія ў гэтым сэнсе саступалі польскім. І ўсё ж беларускім дзеячам удавалася пераканаць частку сялян трымацца беларускіх, а не польскіх, школ. Паспяхова скончылася школьная "баталія" ў вёсцы Гаравая. У 1928/1929 гг. інспектар Я. Кастылюк і кіраўніцтва БША ўзняло перад Даўгаўпілскай павятовай школьнай управай пытанне пра стварэнне ў Юхнявецкай польскай школе беларускага камплекта альбо адкрыццё беларускай прыватнай школы ў вёсцы Гаравая (2 км ад польскай школы). Інспектар сабраў подпісы бацькоў і часткі вучняў, якія "*не дачакаўшыся беларускае школы пачалі хадзіць часова ў Юхніцкую* [Юхнавецкую – ЕГ] *польскую школу*"[672].

У выніку беларуская школа ў Гаравой была адчынена, што стала прычынай непаразуменняў паміж беларускімі і польскімі актывістамі. У чэрвені 1931 г. кіраўнік Гараўскай школы пісаў у БША: "*Сёння я быў у Гаравых і даведаўся ад Міхаліны Кусінь і Тэклі Кусінь, засценак Ляйнікі, што палякі вядуць наступную агітацыю. Учора 19 чэрвеня 1931 год. у засценку Ляйнікі (раён Гараўскай школы) і ў вёсцы Лукштані (раён Талоеўскай школы) з'явілася кіраўнічка Юхніцкай польскай школы М. Сула з поўнымі рукамі папер, як яна казала, з Міністэрства і ўзднай Школьнай управы для рэгістрацыі дзяцей, кажучы: 'Што ўжо закрыты беларускія школы: Гараўская, Талоеўская і Кокінская (Дразды) і што ўсіх трох гэтых школ дзеці павінны адведваць толькі польскія школы ў Юхніках і Індрыцы з пачатку навучальнага 1931/32 года'. Цікава, калі Юхніцкай польскай школы кіраўнічцы М. Сула ёсць такое распараджэнне з Міністэрства аб рэгістрацыі дзяцей у чужых школьных раёнах і аб закрыцці вышэй ужо мянуемых беларускіх школ, чаму вуч. і кіраўнічка М. Сула, рэгіструючы дзяцей у Ляйніках, не заходзіла да бацькоў: Андрэя Брыка і Янкі Сорына (свядомых беларусаў) якія жывуць тут жа на Ляйніцкай зямлі і маюць свае хутары?*"[673]. У адказ аўтар вышэйзгаданых радкоў узяў ад сведкаў падпіску, што кіраўніца польскай школы распаўсюджвае хлуслівыя звесткі пра закрыццё беларускіх школ[674].

Нягледзячы на перашкоды, якія ствараліпалякі, беларускі актыў аптымістычна глядзеў на перспектывы беларускай школьнай справы ў раёнах з каталіцкім насельніцтвам. З назіранняў беларускіх дзеячаў вынікала, што агульнае стаўленне мясцовага сялянства да беларускай школы было пазітыўнае. Падсумоўваючы вынікі працы падчас пасяджэння Рады БША (25 сакавіка 1929 г.), інспектар Я. Кастылюк адзначаў, што беларускамоўныя каталікі

---

[672] LVVA, 2125 f., apr. 5, l. 84, 40 lp.

[673] LVVA, 2125 f., 5 apr., 131 l., 27 lp.

[674] LVVA, 2125 f., 5 apr., 131 l., 37 lp.

Даўгаўпілшчыны значна больш прыхільныя да беларускай справы, чым іх суродзічы праваслаўнага веравызнання на Лудзеншчыне. Ён наступным чынам характарызаваў становішча ў Даўгаўпілскім павеце: "*Тутака справа выглядае значна ляпей. Усе амаль школы складаюцца з вучняў-католікаў, бацькі якіх яшчэ да вайны ўжо адчувалі сябе беларусамі. Блізкасць беларускага нацыянальна-культурнага асяродку – Дзвінска, робіць таксама добрыя ўплывы. Усё-такі і тутака ёсць у некаторых раёнах пэўныя польскія ўплывы, – так напр.[ыклад] у Плейках, дзе бацькі падалі просьбу аб адчыненні польскае школы*"[675]. Пры гэтым інспектар выказаў думку, што ў каталіцкіх раёнах трэба, каб беларускую мову вучні вывучалі па падручніках, выдадзеных "лацінкай" альбо ўводзіліся ўрокі польскай мовы, па два на тыдзень, каб нейтралізаваць спробы пераходу школ у Польскі школьны аддзел[676].

Польска-беларускія школьныя рознагалоссі адлюстраваліся на старонках тагачаснай прэсы. У польскіх перыядычных выданнях гучалі абвінавачванні ў бок беларускіх дзеячаў, што яны перацягваюць у свае школы вучняў польскіх школ прывабліваючы як матэрыяльнымі выгодамі, так і палёгкамі ў навучанні (магчымасцю пераводу ў старэйшыя класы вучняў, якія не паспяваюць). Польскія аўтары не хавалі пагарды ў дачыненні да настаўнікаў-палякаў, якія працавалі ў беларускіх школах. Іх называлі "рэнегатамі", якія, кіруючыся меркантыльнымі памкненнямі, адцураліся польскасці і далучыліся да чужо1 школьнай справы. На старонках выдання "Tygodnik Polski" невядомы аўтар пісаў: "*Ведаю аднаго бацьку, каторага сын з'яўляецца настаўнікам беларускай школы. Бацька цудоўна гаворыць па-польску, моліцца па-польску і лічыць сябе палякам, але сын, які атрымаў пасаду настаўніка ў беларускай школе, ужо не лічыць сябе палякам, а беларусам. Больш за тое, кінуў сваю родную мову ды іншых зараз пераконвае ў тым, што палякаў у Латвіі зусім няма, а ёсць толькі спаланізаваныя беларусы*"[677].

Тым часам беларуская прэса прыводзіла прыклады польскіх злоўжыванняў. "Голас беларуса" паведамляў, што ў Скайсценскай воласці польскія дзеячы ўсялякімі сродкамі "вабілі" ў сваю школу вучняў мясцовай беларускай школы. Паводле звестак беларускага боку, на пасяджэнні валасной рады ў траўні 1931 г. польскія радныя хацелі заблакіраваць рашэнне аб прыняцці Гараўскай беларускай школы на ўтрыманне мясцовага самакіравання[678]. З беларускага боку выказвалася думка, што сябры Саюза палякаў у Латвіі падкуплівалі альбо нават спойвалі настаўнікаў беларускіх школ, каб яны

---

[675] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 95 lp.

[676] Тамасама.

[677] Skajcieńczyk, *Z gminy Skajcieńskiej (b. Izabelińskiej)*, "Tygodnik Polski" 1927, № 75, c. 5; AAN, sygn.: MSZ, t. 5328, k. 37–41.

[678] Тутэйшы земляроб, *Скайсьценская гміна*, "Думка беларуса" 1931, № 2, с. 3–4.

вывелі свае школы з падпарадкавання Беларускага школьнага аддзела[679]. У адной з публікацый К. Езавітаў вінаваціў польскіх дзеячаў у сепаратызме: "*Ведучы тут сваю нацыянальную працу і адваёўваючы ад палякаў у Латвіі сваіх беларусаў-каталікоў, беларусы памяншаюць адсотак польскасці ў Інфлянтах Польскіх (так палякі называюць Латгалію) і такім чынам знішчаюць адзін з аргументаў польскіх, якім палякі аперуюць у адстойванні сваіх прэтэнзіяў да Віленшчыны і Гарадзеншчыны*"[680].

У сваёй большасці абвінавачванні як польскіх, так і беларускіх аўтараў мелі суб'ектыўны характар і адлюстроўвалі спрошчаны пункт гледжання на значна складанейшую з'яву, якой з'яўлялася школьная справа на абшарах з насельніцтвам з несфарміраванай нацыянальнай ідэнтычнасцю. Не разумеючы гэтага, абодва бакі нярэдка вінавацілі ў сваіх няўдачах латвійскія ўлады. Польскія дзеячы не маглі прабачыць латвійскай дзяржаве вынікаў перапісу 1920 г., які "зафіксаваў" на шматэтнічным краявідзе Латгаліі і Ілукшчыны значную колькасць беларусаў. Нагадаем, што менавіта вынікі перапісу далі беларускім дзеячам юрыдычную падставу разгарнуць школьную справу ў Латвіі. Палякі лічылі стварэнне беларускіх школ вынікам "беларускай аперацыі" латвійскіх улад, каб штучна аслабіць пазіцыю палякаў у рэгіёне. У рапарце дзеяча Таварыства крэсавай стражы Яна Вісціцкага (1922 г.) чытаем: "*Галоўны націск беларускай аперацыі скіраваны супраць польскіх школ. Спадар Езавітаў пагражае польскім настаўнікам, што забярэ ўсіх вучняў у беларускія школы. Гарадская прэфектура Даўгаўпілса выразна падтрымлівае кожнае дзеянне беларусаў у гэтым напрамку, неаднойчы даючы доказы саўдзелу ў выкрэсліванні з польскіх школаў дзяцей палякаў і пераводу іх у беларускія, абапіраючыся на тэндэнцыйны і зусім неаб'ектыўны перапіс насельніцтва 1920 года, калі амаль усе палякі былі залічаныя да беларусаў*"[681].

Тым часам польскі карэспандэнт з Лудзеншчыны інфармаваў, што ў Пасіенскай воласці мясцовыя ўлады запісалі ўсіх палякаў беларусамі і адмаўляліся адчыняць польскую школу[682]. Вось якім чынам польскі аўтар характарызаваў сітуацыю вакол школы ў Няўлянах: "*На жаль, бацькі-палякі Няўлянскага раёна, пабачыўшы праблемы, з якімі даводзіцца сутыкацца падчас адкрыцця польскай школы, здаліся і аддалі дзяцей у беларуску школу (…) Ці ж сапраўды няможна было перадухіліць беларусізаванне польскіх дзетак? Спадзяемся, што сумны і балючы стан у Няўлянах выкліча адпаведную рэакцыю з боку Саюза* [Саюза палякаў у Латвіі – ЕГ]"[683]. У лістападзе

[679] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 34, л. 24.

[680] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 96, л. 1–9.

[681] Цыт.: J. Gierowska-Kałłaur, *op. cit.*, s. 208.

[682] *Jeszcze o Posinin*, "Tygodnik Polski" 1925, № 15, s. 7.

[683] *Listy do redakcji*, "Tygodnik Polski" 1927, № 102/103, s. 8.

1926 г. дэпутат Сойма ад польскай меншасці Яраслаў Вільпшэўскі прадставіў міністру асветы мемарандум, у якім падкрэсліваў, што некаторыя латвійскія ўрадоўцы прымушаюць палякаў аддаваць дзяцей у беларускія школы. Як прыклад некампетэнтнасці чыноўнікаў у нацыянальных справах ён прывёў выпадак школы ў Варнавічах (Каплаўская воласць Ілукштанскага павета), дзе, паводле польскага боку, з 104 вучняў палякі складалі 90, якіх мясцовыя ўлады "*ўпарта залічвалі да беларусаў і навучалі рускай мове*"[684]. Падсумоўваючы сітуацыю, рэдакцыя пісала: "*Мы ўсе добра ведаем метады разнастайных чыноўнікаў і правінцыйных кацыкаў, якія не разумеюць духу латвійскай Канстытуцыі (…) Спадар кіраўнік школы ў Варнавічах ужо забыўся, як латвійскае ці польскае грамадства змагалася з расійскай асіміляцыяй, а зараз шукае беларусаў там, дзе іх увогуле няма*".

У той час, як польскія дзеячы вінавацілі латвійскіх урадоўцаў у спрыянні беларускім школам за кошт польскіх, беларускія крыніцы сцвярджалі, што латвійскія ўлады не садзейнічаюць развіццю беларускай школьнай справы[685]. У прыватнасці, гучалі абвінавачанні, што польскія арганізацыі атрымлівалі ад дзяржавы большую грашовую падтрымку, чым беларускія. "Думка беларуса" адзначала, што ў 1931 г. з дзяржаўных сродкаў на падтрымку польскага тэатра было вылучана 13 000 латаў, а на беларускі толькі 4 500. Беларусам не падабалася, што соймавая бюджэтная камісія прызначыла на патрэбы польскіх школ 4 000 лат, а беларускім – напалову менш[686]. Аўтары, аднак, ігнаравалі факт, што памер дзяржаўнай дапамогі залежаў ад колькаснага складу нацыянальнай меншасці. Паводле перапісу 1930 г., палякаў у Латвіі было больш, чым беларусаў.

Стаўленне латвійскіх урадоўцаў да польска-беларускіх школьных непаразуменняў таксама было складанейшым, чым гэта падавалі польскі і беларускі бакі. Як ужо адзначалася, улады ў Рызе ў першыя гады незалежнасці спрыялі беларусам. Разам з тым, мясцовыя школьныя чыноўнікі на ўзроўні павета і воласці ведалі, што беларуская нацыянальная свядомасць у рэгіёне толькі фармуецца. Кіраўнікі мясцовай адміністрацыі ўсведамлялі таксама прысутнасць польскіх уплываў, якія не маглі ігнараваць у паўсядзённай працы. Напрыклад, у лістападзе 1923 г. Лудзенскі школьны павятовы інспектар Свэнэ наведаў Ляўзінскую беларускую школу (Пасіенская воласць). У выніку інспекцыі ён зрабіў выснову, што сярод бацькоў вучняў пераважаюць польскія настроі, якія з'яўляюцца вынікам уплываў каталіцкага духавенства. Інспектар сцвярджаў, што бацькі вучняў на Пасіеншчыне адмоўна ставяцца да ўвядзення ў школы беларускай мовы. Пры гэтым ён адзначаў,

---

[684] *O polskie szkoły*, "Tygodnik Polski" 1928, № 117, с. 2.

[685] Езавітаў, *op. cit.*, с. 56–59.

[686] Дземенскі, *Палёнізацыя*, "Думка беларуса" 1931, № 1, с. 1.

што ў штодзённым жыцці жыхары не карыстаюцца польскай мовай, а размаўляюць "на калечанай расейшчыне". Чыноўнік лічыў, што ў сувязі з гэтай сітуацыяй мэтазгодна весці ў школе выкладанне на рускай мове пры захаванні польскай як спецыяльнага прадмета. Выкарыстанне ж беларускай мовы ён лічыў шкодным, паколькі, па-першае, супраць гэтага выступала большасць бацькоў, а па-другое, гэта толькі ўмацуе польскія тэндэнцыі і выкліча патрэбу ўвядзення польскай мовы. Відавочна, што ўрадовец не разглядаў беларушчыну як эфектыўны сродак супрацьдзеяння польскаму ўплыву. Наадварот, ён ставіўся да яе як да нечага прамежкавага паміж рускай і польскай мовамі. І ўвядзенне беларускай мовы лічыў крокам у бок яшчэ большай паланізацыі мясцовых каталікоў. Сваю пазіцыю Свэнэ тлумачыў наступным чынам: "*Увядзенне выкладання беларускай мовы ў школе не зменшыць польскую тэндэнцыю, але нават умацуе яе, бо супраць беларускай мовы з боку бацькоў адчуваецца вялікая непрыхільнасць і нават нянавісць*"[687].

Інакш сітуацыю бачыў справавод БША Я. Шчорс, які пасля інспекцыі Ляўзінскай школы, адзначаў: "*Заитересовавшись прошлым школы, я узнал аб инертности местного населения, о влиянии костела, о комиссии, приезжавшей определить национальность учащихся, причем в комиссии были латыши, великоруссы. Когда каждый из членов комиссии поговорил с родителями учащихся, не различающими вероисповедения и национальности, то получилось не разьяснение, а затемнение вопроса. Между тем, белорусская национальность учащихся проглядывается ясно даже в акценте произношения латышских слов. Даже настоящий поляк не нашёл бы в говоре местного населения ни одного звука настоящей польской речи*"[688].

Інспектар Свэнэ быў не адзіным урадоўцам, які не разумеў беларускай школьнай дзейнасці. У 1932 г. Алфрэдс Гуртыньш адзначаў, што пасіўнасць латышоў спрыяе дэнацыяналізацыі беларусаў пад уплывам паланізацыі[689]. Такім чынам, можна зрабіць выснову, што ў большасці выпадкаў як польскія, так і беларускія дзеячы няслушна абвінавачвалі латышскую дзяржаву ў стварэнні ім наўмысных перашкод. Імаверна, тым самым яны намагаліся апраўдаць уласныя пралікі і паразы. Разам з тым, здаралася, калі латвійскія ўлады выкарыстоўвалі спрэчкі паміж беларускімі і польскімі дзеячамі ў сваіх нацыянальных мэтах. Бо часам польска-беларускія сваркі за тую ці іншую школу сканчаліся яе перадачай у падпарадкаванне Агульнага школьнага дэпартамента. Такі лёс напаткаў беларускую школу ў вёсцы Дылевічы,

---

687 LVVA, 2125 f., 5 apr., 40 l., 118 lp.

688 LVVA, 2125 f., 5 apr., 34 l., 211 lp.

689 М. Голдманис, *"Белорусский" дискурс в латышской прессе (1920–1934): эволюция представления о белорусах как о самостоятельном национальном меншинстве*, "Латыши и белорусы: вместе сквозь века", Минск 2016, № 5, с. 74.

якую польскія дзеячы спрабавалі ператварыць у польскую. У рэшце рэшт школьныя ўлады падпарадкавалі яе Агульнаму школьнаму дэпартаменту[690].

Канфліктныя сітуацыі паміж беларускімі і польскімі актывістамі здараліся не толькі на школьнай глебе, але і ў сферы дзейнасці культурна-асветных арганізацый. Гэта было звязана з тым, што адны і тыя ж людзі часамі ўдзельнічалі ў польскім і беларускім грамадскім і культурным жыцці. У дакументах Таварыства крэсавай варты можна трапіць на згадкі пра тое, што кіраўнік Таварыства аматараў музыкі і спеву "Гарфа" нейкі Міровіч "*быўшы палякам, але атрымаўшы матэрыяльную падтрымку кіраўніка беларускага руху, пачаў выказваць беларускія тэндэнцыі ў кіраваным ім таварыстве*"[691]. Аўтары рапарта сцвярджалі, што іншым сябрам арганізацыі ўдалося пераканаць яго, каб перарваў сувязі з беларусамі[692]. Польская прэса паведамляла пра падобную сітуацыю ў мясцовасці Індра, дзе дзейнічаў філіял Саюза палякаў у Латвіі[693]. У звароце да жыхароў Пасіенскай воласці дзеячы СПЛ заклікалі ўступаць у арганізацыю нягледзячы на тое, што ў пашпартах іх "памылкова запісалі беларусамі"[694]. На жаль, адсутнічаюць падрабязнейшыя звесткі пра тыя інцыдэнты. Можна, аднак, зрабіць выснову, што ў латгальскіх вёсках і мястэчках ішло "спаборніцтва" паміж польскімі і беларускімі грамадскімі арганізацыямі.

Польска-беларускае саперніцтва адчувалася не толькі ў Латгаліі, але і на тэрыторыі суседняга Ілукштанскага павета. Польскія дзеячы разглядалі Ілукшчыну як адзін з самых польскіх рэгіёнаў Латвіі. Беларускія ж актывісты лічылі, што мясцовае сялянства – беларускае, але з'яўляецца аб'ектам "паланізацыйных тэндэнцый"[695]. Наколькі розныя і суб'ектыўныя могуць быць падлікі выразна паказвае параўнанне двух перапісаў насельніцтва, якія былі праведзеныя польскімі (люты 1919 г.) і латвійскімі (1925 г.) уладамі. Паводле першага, у павеце налічвалася 9 207 палякаў і 1 273 беларусаў. Другі перапіс паказаў, што ў павеце жыло 6 799 палякаў і 6 407 беларусаў[696]. Прадстаўнікі беларускага руху разглядалі Ілукшчыну як рэгіён, якому трэба надаць больш увагі. На іх думку, належала разгарнуць тут сетку культурна-асветных таварыстваў і школ. Яны называлі гэтую працу "перакідваннем мастоў" у Ілукшчыну. Першыя захады па арганізацыі ў павеце нацыянальнага жыцця былі, аднак, няўдалымі. У 1922 г. Міністэрства асветы адхіліла жаданне БША

---

690 НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 34, л. 24.

691 J. Gierowska-Kałłaur, *op. cit.*, s. 207.

692 *Ibidem*.

693 Skajcieńczyk, *Z gminy Skajcieńskiej (b. Izabelińskiej)*, "Tygodnik Polski" 1927, № 75, c. 5.

694 *Związek Polaków w Posinin*, "Tygodnik Polski" 1924, № 24, s. 7.

695 *Мост у Ілукшчыну*, "Думка беларуса" 1931, № 2, с. 1.

696 К. Езавітаў, *op. cit.*, с. 34.

адкрыць у павеце беларускай школы. Беларускія дзеячы трымаліся думкі, што працяглая адсутнасць у павеце беларускіх арганізацый зрабіла магчымай актывізацыю польскага руху. У студзені 1922 г. С. Сахараў адзначаў, што на Ілукшчыне адзначаюцца выразныя польскія тэндэнцыі і прапаноўваў К. Езавітаву абмеркаваць гэту справу[697].

У беларускай прэсе не былі рэдкасцю публікацыі прысвечаныя "паланізацыі" Ілукшчыны. Можна знайсці звесткі пра тое, што польскія дзеячы распаўсюджвалі сярод сялян улёткі, у якіх палохалі, што беларускі рух мае намер насадзіць каталікам праваслаўе. Беларускім арганізацыям не ўдалося дасягнуць поспеху у Ілукшчыне праз эканамічную слабасць і адсутнасць актыўнай падтрымкі з боку латвійскай дзяржавы. У 1926 г. беларускі аўтар з сумам канстатаваў: "*Ілукшчына, у якой жыве шмат беларусаў (…), да гэтага часу ніяк ня можа скрануцца з месца і не выяўляе амаль ніякага нацыянальна-культурнага руху. Няма яшчэ ніводнай беларускай школы – не кажучы аб іншых культурна-прасветных установах*"[698]. Зацікаўленне беларускіх дзеячаў арганізацыйнай працай у павеце ўзмацнілася ў 1931 г., калі латвійскія ўлады дэлегалізавалі дзейнасць Саюза палякаў у Латвіі. Аднак практычных крокаў пасля заяваў не было.

Чарговым полем польска-беларускага канфлікту, хоць і менш заўважным за школьныя справы, было моўнае пытанне ў каталіцкіх храмах Латгаліі. Каталіцкая царква захавала на гэтых тэрыторыях польскі культурны характар, у касцёльным жыцці выкарыстоўвалася польская мова. Камендант-латыш Краславы восенню 1920 г. дакладваў кіраўніцтву, што мясцовыя сяляне на пытанне пра іх нацыянальнасць адказваюць, што з'яўляюцца палякамі, бо спавядаюць каталіцтва[699]. Беларускія дзеячы патрабавалі ўвядзення беларускай мовы ў парафіях, якія яны лічылі беларускімі. Беларускі бок дамагаўся выкарыстання роднай мовы ў казаннях, дадатковых набажэнствах і катэхізацыі моладзі. Гэта выклікала напружанне паміж польскімі і беларускімі дзеячамі, бо стварэнне беларускамоўных парафій магло адбывацца шляхам выціскання з іх польскай мовы. Беларускі актыў разглядаў прысутнасць польскай мовы ў беларускіх прыходах як шкодную з'яву і даводзіў, што нярэдка вернікі не ведаюць сэнсу польскамоўных пацераў, якія прамаўляюць падчас набажэнства[700].

---

[697] LVVA, 2125 f., 5 ap., 42 l., 2 lp.

[698] Б. Зароўскі, *Ілукшчына чакае беларускай працы*, "Голас беларуса" 1926, № 27, с. 2.

[699] Ē. Jēkabsons, *Skład narodowościowy mieszkańców 6 gmin powiatu iłłuksztańskiego w XIX–XX w. jako główny powód sporu terytorialnego między Łotwą a Polską w okresie międzywojennym* [w:] *Granice i pogranicza. Historia codzienności i doświadczeń*, t. I, red. Marzena Liedke, Joanna Sadowska, Jan Trynkowski, Białystok 1999, s. 229–230.

[700] *Письмо в редакцию*, "Рижский курьер" 1923, № 654, с. 3; Кастусёнак, *Кракадзілавы сьлёзы*, "Голас беларуса" 1926, № 35, с. 1.

Першыя крокі да ўвядзенне беларускай мовы ў касцёльнае жыццё латгальскіх каталікоў былі зробленыя ў першыя месяцы дзейнасці таварыства "Бацькаўшчына" і Беларускага школьнага аддзела. 12 снежня 1921 г. кіраўнік БША звярнуўся да пробашча Ландскаронскай парафіі з прапановай раздаць вернікам беларускамоўныя малітоўнікі, пачаць карыстацца, замест польскай, беларускай мовай падчас казанняў і катэхізацыі вучнёўскай моладзі[701]. Адначасова ён звярнуўся да пробашча Брыгаўскага касцёла з просьбай, каб ён пачаў выкладаць рэлігію ў Зілупскай беларускай школе. Таксама кіраўнік БША прапанаваў святару распаўсюдзіць сярод вернікаў беларускамоўную каталіцкую літаратуру[702]. Аднак, як вынікае з ліста Брыгаўскай каталіцкай адміністратуры, такі крок не выклікаў энтузіязму вернікаў. Сяргей Сахараў пракаментаваў гэта наступным чынам: "*Калі б гэта было па-польску, дык і больш бы далі, але па-беларуску задарма нам не трэба*"[703]. У дадзенай сітуацыі С. Сахараў звярнуўся да Рыжскага рыма-каталіцкага архіепіскапа з просьбай пра беларусізацыю царкоўнага жыцця ў парафіях з беларускім насельніцтвам. Ён прасіў, каб туды прызначалі святароў-беларусаў[704]. У адказ архіепіскап запэўніў, што будзе ставіцца да нацыянальных патрэб латвійскіх беларусаў з належным разуменнем[705]. 22 снежня 1921 г. кіраўнік БША прапанаваў дырэктарам школ, у якіх вучні-каталікі складалі нязначную колькасць, не ўводзіць польскую мову. Дадзеная прапанова сустрэлася з разуменнем у некаторых школах[706].

Неабходна, аднак, падкрэсліць, што сярод каталіцкіх святароў было няшмат тых, хто лічыў сябе беларусам. У сувязі з гэтым заклік беларускіх дзеячаў не знайшоў шырокай падтрымкі: мясцовае каталіцкае духавенства, нават калі і паходзіла з Беларусі, не атаясамлівала сябе з беларускімі нацыянальнымі каштоўнасцямі. Вядома, што ў Латгаліі было ўсяго некалькі каталіцкіх святароў, якія падтрымлівалі ідэю ўвядзення беларускай мовы ў касцёлы. Гэта былі а. Аляксандр Альшэўскі (пробашч парафіі ў Рунданах) і а. Язэп Гайлевіч (пробашч парафіі ў Індры і вікарый парафіі Сэрца Хрыстовага ў Рэжыцы). Яны прамаўлялі казанні і катэхізавалі моладзь па-беларуску[707]. Беларуская прэса з гонарам паведамляла, што кс. А. Альшэўскі ўпершыню пачаў выкладаць навуку рэлігіі па-беларуску, і мясцовыя сяляне ахвотней пачалі наведваць

---

[701] LVVA, 2125 f., 5 apr., 102 l., 5 lp.

[702] LVVA, 2125 f., 5 ap., 93 l., lp. 4–5.

[703] LVVA, 2125 f., 5 ap., 93 l., 3 lp.

[704] Э. Екабсонс, *op. cit.*, с. 50.

[705] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 51, л. 64.

[706] LVVA, 2125 f., 5 apr., 102 l., 6 lp.

[707] J. Garbiński, J. Turonek, *Białoruski ruch chrześcijański XX wieku. Słownik biograficzno-bibliograficzny*, Warszawa 2003, s. 112, 289; *Z żyćcia Biełarusoŭ-Katalikoŭ u Łatwii*, "Беларуская крыніца" № 22 ад 20 траўня 1934 г., с. 2.

касцёл[708]. Акрамя таго, кс. Я. Гайлевіч быў сябрам беларускіх арганізацый і матэрыяльна падтрымліваў мерапрыемствы беларусаў (ахвяраваў грошы на газету "Голас беларуса"). Заслугоўвае ўвагі, што сярод каталіцкіх святароў, якія прыхільна ставіліся да беларускай справы, быў літовец кс. Антоніс Шылініс (памёр 24.07.1926 г.), які на пачатку 1920-х гг. быў катэхетам у Даўгаўпілскай беларускай гімназіі і праводзіў заняткі рэлігіі па-беларуску[709]. Паміж святаром і беларусамі склаліся цёплыя адносіны. Адзін з вучняў гімназіі ўзгадваў, што святар "*хоць і быў ліцвінам, але ведаў дарогу да сэрца нашай моладзі, вучачы кахаць сваю родную беларускую мову, на якой ён заўсёды выкладаў рэлігію*"[710]. У кастрычніку 1923 г., калі латвійскія ўлады не працягнулі яму права на знаходжанне ў Латвіі, БША прасіў пакінуць яго ў Даўгаўпілсе, аргументуючы тым, што ў горадзе няма іншых беларускамоўных каталіцкіх святароў[711].

Аднак жменька святароў не была ў стане істотна паўплываць на пашырэнне беларускай мовы ў касцёльных мурах. Карэспандэнт "Голасу беларуса" з жалем канстатаваў: "*На ўсю беларускую каталіцкую людnасць у Латвіі мы толькі і маемо двух шчырых ксяндзоў-беларусаў: кс. Альшэўскага ў Рунданах ды кс. Гайлевіча ў Бальбінове. Рэшта ксяндзоў – альбо спалячваюць наш народ польскімі казаннямі ды маленнямі, або робяць спробы нас аблатышыць і даводзяць, што беларусы гэта 'быўшыя латышы-латгальцы'*"[712]. Беларускі актыў спрабаваў заахвоціць да душпастырскай працы ў Латвіі святароў-беларусаў з іншых краін. 5 чэрвеня 1930 г. на прапанову У. Пігулеўскага Рада БША вырашыла запрасіць кс. Язэпа Рэшаця і кс. Вінцэнта Гадлеўскага прыехаць у Рыгу, каб выкладаць па-беларуску Слова Божае ў сталічных школах[713]. З невядомых прычын задума засталася няздзейсненай. Часамі вернікаў у Латгаліі наведвалі беларускія святары з Друі: а. Андрэй Цікота, а. Фабіян Абрантовіч і а. Язэп Германовіч. Аднак іх рэдкія і непрацяглыя візіты не маглі істотна паўплываць на настроі латгальскіх беларусаў[714].

Гісторыя захавала прыклады варожага стаўлення некаторых святароў да спроб беларусізацыі касцёльнага жыцця. Аляксей Барткевіч узгадваў, як ксяндзы адмаўляліся адпраўляць жалобныя набажэнствы па памерлых беларускіх настаўніках[715]. Можна прывесці прыклад канфлікту паміж

---

[708] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 134, л. 48.

[709] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 134, л. 52.

[710] "Школьная праца" 1926, № 5, с. 2.

[711] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 43, л. 23.

[712] *Беларускае жыцьцё у Латвіі*, "Голас беларуса" 1926, № 22 ад 13 кастрычніка, с. 4.

[713] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 19 lp.

[714] П. Мірановіч, *Беларусы ў Латвіі 1919–1944* [у:] *Крывіцкія руны. Вып. II: Беларускі культурны мацярык у Латвіі*, рэд. М. Казлоўскі, С. Панізнік, Менск 2017, с. 329.

[715] *Крывіцкія руны. Вып. II: Беларускі культурны мацярык у Латвіі*, рэд. М. Казлоўскі, С. Панізнік, Менск 2017, с. 308.

беларускімі актывістамі і кс. Таборэ, пробашчам парафіі ў Пустыні. У беларускай прэсе можна прачытаць, што святар дэманстраваў варожасць да бацькоў, чые дзеці вучыліся ў беларускай школе[716]. Яшчэ ў лістападзе 1921 г. беларускія настаўнікі Пустыншчыны скардзіліся ў БША на кс. Таборэ і яго польскіх прыхільнікаў, вінавацячы ў абразах беларускай школы і беларускай мовы. Настаўніка Юхнявецкай беларускай школы і каталік Віктар Дзяргач паведамляў, што святар скардзіўся супрацоўніку палітычнай паліцыі: маўляў, беларускія настаўнікі "будуюць Беларусь", заганяюць у свае школы дзетак і прымушаюць іх купляць беларускія кніжкі. У выніку некаторых настаўнікаў выклікалі ў паліцыю на допыты[717]. Тым часам, кіраўнік Жакелаўскай беларускай школы Эдвард Вайводзіш у 1923 г. паведамляў БША, што бацькоўскі сход 9 снежня 1923 г. нечакана ўзняў пытанне пра ўвядзенне польскай мовы ў школе пасля таго, як кс. Таборэ ўпершыню завітаў у школу, каб правесці заняткі Закону Божага[718].

З цягам часу дачыненні паміж святаром і беларусамі не палепшыліся. У 1931 г. адзін пустынец на старонках "Голасу беларуса" абураўся, што а. Таборэ падчас казанняў звяртаўся да моладзі па-польску. Аўтар спасылаўся на вынікі перапісу насельніцтва 1930 г., паводле якога ў парафіі налічвалася 3 250 беларусаў і толькі 344 палякі: "*Ці не паланізацыяй можна была б назваць і працу нашага духоўнага айца кс. Таборэ? І запраўды, жывучы ў дэмакратычнай Латвійскай дзяржаве, дзе ўсім дана свабода, чаму мы павінны кожны раз перад выбарамі ў самаўрады і Сойм выслухваць навучанні і настаўленні (нават на споведзі) галасаваць толькі за польскі спісак? Чаму па настаянню гэтага самага кс. Таборэ і маленькай жменькі палякаў у нашай воласці адчынены тры польскія школы, дзе не толькі вучаць Богу маліцца па-польску, але і зусім апалячваюць нашых беларускіх дзетак? Апісваючы ў кароткіх словах сваё жыццё, мы не пакідаем надзеі, што народнымі прадстаўнікамі будзе звернута на наш кліч належная ўвага*"[719]. У сярэдзіне 1933 г. кс. Таборэ быў пераведзены ў Краславу. Мясцовыя беларускія актывісты сцвярджалі, што прычынай былі непаразуменні паміж пробашчам і вернікамі-беларусамі, якія не жадалі, каб святар запісваў іх дзяцей палякамі. У лісце карэспандэнта "Голасу беларуса" чытаем: "*І вось з 15 верасня гг. прыязджае да нас новы пробашч кс. Раманоўскі. Спадзяёмся, што новы кс. Пробашч добра нас зразумее, што мы не ёсць бальшавікі-недавяркі, але мы ёсць рэлігійныя каталікі-беларусы, якія жадаемо і надалей быць рэлігійнымі і чуць слова Божае ў касцёле на сваей роднай мове. Няхай Бог памагае*

---

[716] *Беларускае жыцьцё*, "Голас беларуса" 1925, № 3 ад 1 ліпеня, с. 3.

[717] LVVA, 2125 f., 5 ap., 136 l., 11 lp.; LVVA, 2125 f., 5 apr., 135 l., 3–5 lpp.

[718] LVVA, 2125 f., 5 ap., 136 l., 33–34 lpp.

[719] Пустынец, *В. Пустынь*, "Думка беларуса" 1931, № 2, с. 3.

пробашчу працаваць на карысць касцёла. А Вам кс. Таборэ падказа: 'Не пішы беларусаў у палякі'"[720].

Захаваліся асобныя сведчанні як беларускага, так і польскага бакоў наконт стаўлення вернікаў да спроб увесці беларускую мову ў касцельнае жыццё. Складана, аднак, іх лічыць цалкам аб'ектыўнымі: беларускі бок засяроджваўся на пазітыўных момантах, а польскі на адмоўных. Беларускія дзеячы бачылі ва ўвядзенні беларускамоўных казанняў пачатак натуральных і непазбежных змен у жыцці латгальскіх каталікоў. Тым часам, польскія аўтары разглядалі з'яўленне ў святынях новай мовы як нейкае "дзівацтва". Напрыклад, у польскіх перыядычных выданнях адзначалася, што беларуская дзейнасць у мурах касцёлаў выклікала абурэнне вернікаў. Ананімны аўтар, які падпісаўся "парафіянін", на старонках газеты "Tygodnik Polski" крытыкаваў дзейнасць кс. А. Альшэўскага сцвярджаючы, што "паважаны святар, які паходзіць з польскай сям'і" не павінен уводзіць беларускую мову ў царкоўнае жыццё, бо гэта супярэчыць "звычаям і традыцыі бацькоўскай веры". Аўтар наступным чынам пратэставаў супраць "беларусізацыі" парафіі ў Рунданах: "*Дзівацтвам для нас, палякаў-каталікоў, з'яўляецца сама беларуская мова ў каталіцкім касцёле, паколькі на гэтай мове мы не молімся і не прамаўляем пацер, бо чытаем толькі з польскіх кніг, а пацеры, як і нашы дзеці, прамаўляем толькі па-польску, таму не можам ніякім чынам пагадзіцца з тым, каб тут на цалкам чужой для нас мове святар-паляк, ды яшчэ ў касцёле, прамаўляў да нас па-беларуску*"[721].

У сваю чаргу, беларуская прэса падкрэслівала, што вернікі віталі з'яўленне роднай мовы ў храмах. На старонках беларускіх выданняў змяшчаліся лісты парафіян, якія падтрымлівалі беларускамоўныя казанні і пратэставалі супраць іх знікнення[722]. Газета "Голас беларуса" пісала: "*Навука на беларускай мове вельмі падабаецца сялянам, затое вельмі абражана шляхта, якая нават выходзе з касцёлу, не даслухаўшы навукі, бо не можа пагадзіцца з тым, што ксёндз гавора казанні на 'простай' беларускай мове. Той жа самы ксёндз прыязджае адпраўляць імшу ў маёнтак Істру, дзе таксама гавора навуку па-беларуску. Не шкодзіла бы і нашым 'бацюшкам' набрацца розуму і пачаць казанні па беларуску*"[723].

Як бачна, абодва бакі заўзята і эмацыйна баранілі свой пункт гледжання. Удзельнікі спрэчкі разумелі важнасць пытання, бо справа тычылася ўплыву на традыцыйную сялянскую супольнасць. Няма адпаведных крыніц, каб

---

[720] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 134, л. 72.

[721] Parafianin, *Dziwoląg w kościele*, "Tygodnik Polski" 1927, № 107, с. 4.

[722] *Беларускае казаньне ў Пасіне*, "Голас беларуса" 1926, № 40, с. 4.

[723] *Ксяндзы беларусы вядуць нацыянальную працу*, "Голас беларуса" 1926, № 38 ад 4 жніўня, с. 4.

вызначыць, якое ў рэальнасці стаўленне было ў вернікаў да моўных пытанняў. Але на падставе звестак, якія маем, можна меркаваць, што з'яўленне беларускай мовы ў касцельных мурах выклікала розныя рэакцыі. У 1930 г. а. Курляндскі, пробашч парафіі ў Малой Індрыцы, пачаў прамаўляць казанні па-беларуску. Справа скончылася вэрхалам і адкліканнем святара ў іншую парафію. Сімпатыі вернікаў падзяліліся[724]. Беларускія дзеячы прызнавалі, што некаторыя беларускамоўныя каталікі не разумеюць патрэбы ўвядзення роднай мовы ў касцёльнае жыццё, бо "Бог не разумее беларускага малення", а толькі польскае[725].

Наогул, адносіны паміж беларускім нацыянальным актывам у Латвіі і каталіцкім духавенствам мала розніліся ад адносін паміж гэтымі групамі ў на беларускіх землях у пачатку XX ст. Прорва, якая падзяляла беларускіх дзеячаў і святарства, заставалася непераадоленай. І не была гэта віна беларускіх адраджэнцаў, якія ў большасці трымаліся левых поглядаў. Пазіцыя тагачаснага духавенства Каталіцкай царквы была далёкая ад чаканняў беларускага актыву. Таму не павінны здзіўляць словы ананімнага карэспандэнта "Голасу беларуса", які так апісваў дзейнасць пастыраў сярод беларускіх вернікаў у Латвіі: "*Ваўкі, якія хочуць знішчыць беларускую людназь і штучна распладзіць на яе месцы іншыя нацыянальнасці*"[726].

Аднак былі і аб'ектыўныя прычыны, па якіх беларусізацыя царкоўнага жыцця ішла павольна. Многія беларускамоўныя сяляне-каталікі ўмелі чытаці толькі па-польску (дзякуючы кантычкам і малітоўнікам). Беларуская мова была новым элементам у міжнацыянальных справах Каталіцкай царквы ў Латвіі. У кансерватыўным сялянскім асяроддзі традыцыя мела вялізнае значэнне, а яе неад'емнай часткай была мова, да якой прызвычаіліся вернікі. Беларускія ж святарскія кадры былі нешматлікія, патрабаваўся час, каб нешта змянілася.

Спробы ўвядзення беларушчыны ў рэлігійнае жыццё адбываліся на фоне вострага польска-латвійскага моўнага канфлікту ў Каталіцкай царкве Латвіі. Латвійскі ўрад фарсіраваў замену польскай мовы на латышскую ў латгальскіх святынях. Гэтая палітыка мела аб'ектыўнае і рацыянальнае абгрунтаванне: большасць мясцовых каталікоў дэкларавала латышскую (і латгальскую) нацыянальнасць[727]. У шэрагу парафій святары былі вымушаныя

---

[724] Індрыцкі парахвіянін, *Вёска М. Індрыца. Як палякі зьневажалі Найсьвеншы сакрамэнт і чаму Індрыцкая парахвія засталася без ксяндза*, "Наша доля" 1930, № 3, с. 3–4.

[725] Ізабэлінец, *На чым трымаецца 'польскасьць' у Латвіі?*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1927, № 4(2), с. 44.

[726] *Беларускае казаньне ў Пасіне*, "Голас беларуса" 1926, № 40, с. 4.

[727] Паводле перапісу насельніцтва ў 1930 г. латышамі запісаўся 81,4% каталікоў у паўночна-ўсходняй частцы Латвіі.

прамаўляць казанні двойчы: па-латышску і па-польску[728]. Здараліся выпадкі выкарыстання амбону ў палітычных мэтах. Святароў, якія не падпарадкоўваліся загаду і працягвалі трымацца польскай мовы, пераводзілі ў іншыя парафіі альбо выдалялі з краіны, абвінаваціўшы ў нелаяльнасці да дзяржавы[729]. Тым часам улады ў Варшаве лічылі, што знікненне польскай мовы з касцёлаў у Латгаліі і Ілукшчыне прывядзе да хуткай асіміляцыі мясцовых палякаў. Польскія ўлады намагаліся забяспечыць латгальскім палякам кантакт з роднай мовай у касцёльных мурах, адпраўляючы ў Латвію святароў з Польшчы, што нярэдка сустракала супраціў латвійскіх улад. Польскі бок дэлегаваў ксяндзоў пад выглядам душпастыраў для польскіх эмігрантаў. Улады ў Варшаве разлічвалі, што гэтыя святары змогуць "цішком" апекавацца латгальскімі палякамі[730].

Польшча разглядала праявы беларусізацыі касцёльнага жыцця ў Латвіі як свядомую палітыку латвійскіх улад, скіраваную на аслабленне польскіх уплываў у латвійскім каталіцтве. У адным з рапартаў МЗС Польшчы чытаем, што латвійскі бок "*беспаспяхова імкнецца выкараніць польскую мову са святынь, навукі рэлігіі і катэхізацыі шляхам увядзення латышскай мовы, а там, дзе гэта пакуль што немагчыма, уводзіць беларускую, літоўскую ці нават рускую*"[731]. Мы не валодаем пераканаўчымі доказамі таго, што латвійскія ўлады выкарыстоўвалі беларускую мову як сродак абмежавання польскіх уплываў у касцёльным жыцці. Хутчэй за ўсё, гэта было немагчыма з прычыны нязначных магчымасцей уплыву беларускай інтэлігенцыі на духавенства. Нельга, аднак, адмаўляць, што імкненне беларускага актыву да дэпаланізацыі царкоўнага жыцця шмат у чым супадала з поглядамі латвійскіх улад. І адны, і другія былі зацікаўленыя ў абмежаванні колькасці святароў-палякаў у латгальскіх і ілукштанскіх парафіях. У той самы час, калі ўлады ў Рызе лічылі святароў-палякаў перашкодай на шляху да культурнай інтэграцыі рэгіёну з латвійскай дзяржавай, беларускія дзеячы глядзелі на польскіх святароў як на элемент, які замінае беларусізацыі. Беларускі актыў станоўча ўспрыняў наступ латвійскіх улад на польскасць у касцёлах. Беларуская прэса з захапленнем асвятляла працу парламенцкай камісіі па расследаванні "антыдзяржаўнай" дзейнасці польскіх арганізацый, звяртаючы ўвагу на "шкодніцкую працу ксяндзоў з Польшчы"[732].

Спрэчкі паміж беларускімі і польскімі дзеячамі пераносіліся ў парламенцкія муры. Дэпутат-паляк Я. Вежбіцкі падтрымаў прапанову рускіх дэпутатаў

---

[728] A. Skrzypek, *Stosunki polsko-łotewskie 1918–1939*, Gdańsk 1997, s. 113.

[729] J. Albin, *Polski ruch narodowy na Łotwie w latach 1919–1940*, Wrocław 1993, s. 191–192.

[730] AAN, MSZ, t. 10474, Notatka Wydział II w sprawie rokowań polsko-łotewskich, 21 II 1938, k. 10.

[731] AAN, MSZ, t. 10475, Szkolnictwo polskie na Łotwie, 1938, k. 15.

[732] *'Кашачыя канцэрты' ў касьцёлах Ілукшчыны*, "Думка беларуса" 1931, № 2, с. 2.

не вылучаць з дзяржаўнага бюджэту сродкі на патрэбы беларускіх школ у 1922/1923 гг. Падчас выступу ў часе абмеркавання бюджэту 5 ліпеня 1923 г. ён звяртаў увагу на "шкоднасць стварэння беларускага руху для польскай меншасці і ўсёй дзяржавы"[733].

Тым часам дэпутат-беларус У. Пігулеўскі неаднойчы атакаваў польскіх актывістаў. У 1931 г. ён выступіў у Сойме з вострай крытыкай палітыкі польскіх арганізацый у дачыненні да беларусаў. Палітык звінаваціў некаторых польскіх дзеячаў у правакацыйнай дзейнасці, скіраванай супраць беларускай меншасці. Ён звярнуў увагу на тое, што на старонках польскіх выданнях з'явіліся артыкулы антыбеларускага зместу, аўтары якіх вінавацілі беларускіх актывістаў у камуністычнай дзейнасці. Ён лічыў гэта формай паклёпніцтва. Паводле дэпутата, гэтыя "даносы" паўплывалі на тое, што латвійская дзяржава пачала з асцярогай ставіцца да беларускага руху[734].

Дыскусійным з'яўляецца пытанне пра магчымую датычнасць польскага боку да беларускага працэсу. З вуснаў беларускіх дзеячаў неаднойчы гучалі сцвярджэнні, што польскія і рускія сілы цкавалі беларусаў, у выніку чаго, як сцвярджаў С. Сахараў, "*усякія чуткі і абвінавачанні беларусаў у левізне прывялі к беларускаму працэсу 1–2 красавіка 1925 г.*"[735]. Напрыклад, К. Езавітаў адзначаў, што на беларусаў "*паліліся са шпальтаў польскае і велікароскае прэсы цэлыя бочкі памыяў, у дзяржаўныя латвійскія ўстановы пасыпаліся даносы аб палітычнай 'нядобранадзейнасці' беларусаў, было справакавана некалькі вобыскаў па вёсках у свядомых беларускіх вучыцялёў і нават зроблены быў вобыск у самога старшыні Т-ва 'Бацькаўшчына' (...) І ў Дзвінску, і ў Люцыне на сходах Школьных упраў, а часам і ў Думе адбываліся запраўдныя 'беларускія дні', запраўдныя аратарскія бойкі, на якіх супраць беларусаў 'аб'яднаным фронтам' выступалі палякі і велікарусы*"[736].

Тым часам, У. Пігулеўскі ў артыкуле, скіраваным супраць польскага выдання "Dzwon", пісаў: "*Кідаючы латвійскім беларусам абвінавачанне, што яны, быццам, цягнуць у бок Савецкай Беларусі і з'яўляюцца нацыянальнасцяй, якую не сёння – заўтра засадзяць у астрог за камунізм, – паны гэтыя спадзяюцца, што беларусы паверацъ іх брахні, напалохаюцца і ўсе, як адзін, запішуцца палякамі (...) Вы, найміты гэтых самых польскіх паноў, нападаючых сёння на беларускае сялянства і рабочых, хочаце, каб яны зракліся*

---

[733] К. Езавітаў, *op. cit.*, с. 70; *Государственный бюджет в Сейме*, "Рижский курьер" 1923, 5 июля, с. 3.

[734] *Паланізацыя ў Латвіі*, "Беларускае слова" 1931, № 1, с. 3.

[735] Цыт.: Д. Крэнт, *Матэрыялы Цэнтра даследаванняў старадрукаваных кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі як крыніца па гісторыі беларускага нацыянальна-культурнага жыцця ў Латвіі ў 1920–1930-ыя гг.*, "Латыши и белорусы: вместе сквозь века" 2023, № 12, с. 117.

[736] К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі,* Рыга 1927 [перадрук: Нью-Ёрк – Менск 2013], с. 54, 83.

саміх сябе, каб яны паспрабавалі зрабіцца хоць на паперы палякамі. А заўтра вы прададзіце гэтых самых беларускіх сялян, таксама як запраўдных польскіх сялян і рабочых, бо выгнаныя з Латвіі польскія паны плацяць вам сёння грошы за тое, што вы гатуеце дарогу для іх звароту на іхнія маёнткі. Ператварыўшы штучна беларускую і латгальскую люднасць у палякаў, вы потым пачнеце зноў крычаць: 'Вось бачыце, у Ілукшчыне большасць палякаў, а знача трэба яе далучыць да Польшчы'. А гэта значыць, і польскіх, і беларускіх, і латгальскіх сялян зноў аддаць пад бізун польскіх абшарнікаў, гэта значыць – адабраць ад сялян назад зямлю і аддаць яе вашым гаспадарам. Вось што маюць на мэце вашыя сённяшнія правакацыйныя даносы на беларусаў"[737]. Заява беларускага дзеяча выклікала водгук мясцовых польскіх актывістаў. У газеце "Dzwon" выйшаў крытычны артыкул, аўтар якога называў У. Пігулеўскага "дэмагогам", "нахабным ілгуном" і "небяспечна хворым разумова". Аўтар адзначаў: "*Не кажучы пра тое, што гэты тып у адносінах да палякаў, прадстаўнікоў народа, якога не варты нават быць нікчэмным пахолкам, дазваляе сабе выкрыкі накшталт таго, як 'пайшлі вы ўсе к чорту!' і г.д. – гэты спадар асмеліўся закідаць нам жаданне адабраць зямлю ў сялян, дзяржаўную здраду ў адносінах да латвійскай дзяржавы і цэлы шэраг падобных прыдумак, якія могуць нарадзіцца хіба што толькі ў галаве вар'ята альбо, таксама, у засмечаных глуздах платнага бальшавіцкага агента*"[738].

Лідары беларускага руху не выключалі, што польскі бок спрычыніўся да фабрыкавання доказаў віны беларускіх дзеячаў. У прыватнасці, У. Пігулеўскі лічыў невыпадковым, што напярэдадні арыштаў у Латвію трапіла кніга Канстанціна Сракоўскага *Нацыянальная справа на Крэсах Усходніх* (Кракаў 1924), дзе сцвярджалася, што беларускія дзеячы накіраваліся ў Латвію з мэтай вядзення там палітычнай дзейнасці на карысць Савецкай Беларусі[739]. Улады ў Варшаве рашуча адмаўлялі датычнасць да беларускага працэсу. Кіраўнік польскага генеральнага консульства ў Менску Тадэвуш Пэркоўскі востра адрэагаваў на выступ Я. Райніса падчас беларускай мовазнаўчай канферэнцыі (1926 г.). Апошні адзначаў, што абвінавачанні ў адрас беларускіх актывістаў былі "*цалкам неабгрунтаваныя і што ўся справа была зрэжысіраваная не праз латышскі асяродак, але праз (...) шляхту, што жыве ў Латгаліі*"[740].

Польская і беларуская прэса ў Латвіі надавала няшмат увагі польска-беларускім дачыненням, але часам на яе старонках з'яўляліся публікацыі на гэтую тэму. Яны зазвычай былі вытрыманыя ў вострым тоне, поўныя

---

[737] У. Пігулеўскі, *Аб беснаватых людзёх*, "Наша доля" 1930. № 2 ад 7 лютага, с. 2.

[738] A. Mickiewicz, *Piguły niejakiego Pigulewskiego*, "Dzwon" 1931, № 18, s. 1.

[739] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1527; БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 56, л. 23, 63.

[740] М. Каралёў, *Яніс Райніс і Эрнэст Блесэ на і аб Акадэмічнай канферэнцыі ў Менску (1926)*, "Латыши и белорусы: вместе сквозь века" 2023, № 12, с. 92.

абразаў і кпін у бок прадстаўнікоў супрацьлеглага лагера. У польскай прэсе падкрэслівалася, што мясцовы беларускі рух гэта штучная з'ява і вынік палітыкі латвійскіх улад, скіраванай на аслабленне польскіх уплываў[741]. У адным з нумароў газеты "Dzwon" чытаем: "*Нават менш свядомыя нашы суайчыннікі змаглі шмат чаму навучыцца (…) што так званыя беларусы коштам палякаў маюць столькі школ, колькі ім захочацца, а і самі школы інакш выглядаюць, бо маюць прыгожыя, добра абсталяваныя памяшканні, а дзеці, якія бегаюць у гэтыя школы, атрымліваюць на снеданне абаранкі, пернікі і абутак. Ведаюць нашы дзеці ад бацькоў, бо гэныя ім растлумачылі, што беларуская нацыянальнасць у нас штучна створаная, а каб адабраць зямельную маёмасць у палякаў і перадаць беларусам, з гэтай менавіта мэтай розныя 'кацыкі' намагаюцца палякаў запісаць беларусамі, каб палякаў было менш, а беларусаў больш*"[742].

Другім матывам польскай прэсы было атаясамліванне беларускага руху з бальшавізмам. Следам за гэтым ішла думка, што "беларуская аперацыя" латвійскіх улад прынесла шкоду самім латышам: "*Найгоршы, аднак, на гэтым сам урад зрабіў інтарэс, бо хутка знайшліся разумнікі, якія, выкарыстоўваючы тое, што ў Латвіі столькі беларусаў, пачалі – вядома, за чые грошы – агітацыю не толькі за беларускія школы, якіх ніхто не прасіў і не хацеў, а якія цэлымі дзясяткамі Бог ведае навошта і дзеля каго адчынены – але, што горш, – агітацыю за далучэнне Латгаліі да Саветаў. Выходзіла беларуская газета 'Голас беларуса' – з школьным дадаткам, у якім нават без усялякіх цырымоніяў праводзілася савецкая палітыка. Памятаеце розныя авантуры і працэсы з правадырамі беларусаў, – хоць здолелі своечасова схаваць канцы ў ваду, але ахвоту да такой работы адбілі ім на доўга. Памятаеце, як намагаліся ў сойм правесці сваіх 'беларусаў' – а перапіс жа насельніцтва паказаў каля 70 тыс. беларусаў, дык павінна было б быць прынамсі некалькі беларускіх дэпутатаў, а тым часам аніводнага не выбралі, бо так як ніхто беларускіх школаў не прасіў, таксама нікому ў галаву не прыйшло галасаваць за беларускі нумар. Лухта была, лухта і выйшла*"[743]. Яшчэ больш катэгарычным быў аўтар артыкула ў выданні "Tygodnik Polski": "*У 'стварэнні' беларусаў былі перадусім зацікаўленыя латвійскія шавіністы, якія намагаліся і намагаюцца паменшыць 'польскую небяспеку' – шляхам масавага залічвання палякаў да беларускай нацыянальнасці. З іншага боку, гэтыя трансфарматарскія захады нашых неабачлівых палітыкаў адразу*

---

741 *Dziwoląg w kościele*, "Tygodnik Polski" 1927, № 107, c. 4; *Z gminy Skajcieńskiej (b. Izabelińskiej)*, "Tygodnik Polski" 1927, № 75, s. 5; *Zbliżają się wybory*, "Dzwon" 1931, № 14, s. 1.

742 J. Tom, *Co każda polka i każdy polak wiedzieć powinni*, "Dzwon" 1930, № 16, s. 2.

743 A. Iłgowski, *Ciekawe cyfry. W związku z mającym się odbyć z 11–12 b.m. spisem ludności*, "Dzwon" 1930, № 14, s. 1.

ж здолела выкарыстаць Савецкая Расія. Суседнія з Латвіяй землі былі ўключаныя ў Беларускую сацыялістычную рэспубліку і ва ўсёй Латгаліі пачалася камуністычная прапаганда пад выглядам беларускага нацыянальнага руху. Адчыняюцца там беларускія ўсеагульныя і сярэднія школы, лепшыя за латвійскія. Выходзяць розныя беларускія часопісы. Мясцовы беларускі селянін грае ў гэтым зусім пасіўную ролю, паддаючыся некрытычна ўсім 'эксперыментам'. Усю справу праводзіць жменька беларускай інтэлігенцыі, сярод якой шмат расейцаў з Разані і Казані. А паколькі яны, як сапраўдныя рускія людзі, здольныя да ўсяго, робяць зараз у нас за добрыя грошы 'Беларусь', каб у будучыні Расія, магчыма, Беларуская савецкая рэспубліка, мела чым абгрунтаваць свае прэтэнзіі на гэтыя тэрыторыі"[744].

Прадстаўнікі польскай меншасці ў Латвіі займалі крытычную пазіцыю да беларускай прэсы. У артыкуле, прысвечаным газеце "Наша доля" можна прычытаць: "*У прынцыпе, мы не маем нічога супраць таго, калі выйсце газеты з'яўляецца праявай натуральнай экспансіі мясцовага беларускага руху, які не падтрымліваецца грашова і маральна бальшавікамі. Пакуль у змесце гэтага выдання мы не заўважылі праяваў залежнасці ад бальшавіцкай Расіі, але даходзяць да нас весткі, што гэта закардонная работа*"[745]. Аднак найвастрэй палякі крытыкавалі рэдагаваны К. Езавітавым "Голас беларуса". На старонках выдання "Tygodnik Polski" чытаем: "*Ляжыць перад намі № 4 часопіса, які выходзіць у Рызе 3 разы на месяц пад назвай 'Голас беларуса'. Гэта адзіны беларускі часопіс у Латвіі (...) Склад выдання цалкам удалы. Ёсць нават літаратурны 'куток' (...) Але, акрамя гэтага, выданне мае шмат непаладак. Перадусім гаворка ідзе пра мову. Хто ведае мову беларускага насельніцтва, прынамсі ў Латгаліі, той не мае сумневаў, што аўтары артыкулаў, якія друкуюцца ў 'Голасе беларуса' ўвогуле не сутыкаліся з той мовай у жыцці, а маюць з ёй пасрэднае знаёмства за пасрэдніцтвам кепскіх школьных падручнікаў*"[746]. Яшчэ больш засцярог гэты ж аўтар меў да палітычнай лініі газеты: "*Мядзвежую паслугу робіць сп. Езавітаў беларусам, намагаючыся схіліць да пазычання 'святла з усходу'. Няма там святла, а замест яго трупная фосфарная гнілізна і крывавае зарыва пажараў. Беларускія людзі павінны з агідаю адвярнуцца ад сённяшняй савецкай 'Беларускай рэспублікі', якая на столькі з'яўляецца беларускай, на колькі Варшава была 'польскім царствам' пад царскай уладай, хоць так сапраўды называлася. У 'Голасе беларуса' ідзе гаворка, як бачна, не столькі пра кепскі ці добры ўрад у Польшчы і яго стаўленне да беларусаў, колькі пра адданне іх пад апеку 'матухны Расіі', бо*

---

[744] *Czy po to Batory przywiódł nas nad Dźwinę byśmy powiększali szeregi Białorusinów? Błędy urzędowej statystyki narodowościowej*, "Tygodnik Polski" 1928, № 119, s. 2.

[745] A. Mickiewicz, *Piguły niejakiego Pigulewskiego*, "Dzwon" 1931, № 18, s. 1.

[746] *'Hołas Biełarusa'*, "Tygodnik Polski" 1925, № 21, s. 1.

самастойна існаваць не ўмеюць, пра што сведчыць тое, што вызваленчы рух яшчэ разумеюць як вір беспакараных забойстваў і рабункаў. Грамадзянін Езавітаў, дрэнна гуляеце ў беларуса"[747]. Нагодай да з'яўлення вышэйзгаданай публікацыі стаў, між іншым, верш аўтарства К. Езавітава *Беластаччанам* (напісаны 28 траўня 1923 г. пад псеўданімам "Кастусёнак"), перапоўнены пафасам антыпольскай партызанкі на Беласточчыне[748]. Пяру беларускага дзеяча належаў таксама артыкул *Як польскія паны хацелі б падзяліць Расію*, у якім ён кпіў з імперскіх планаў некаторых прадстаўнікоў польскай грамадска-палітычнай думкі[749].

Не пакінуў рэдактар "Голасу беларуса" без увагі і згаданую публікацыю "Tygodnika Polskiego". Ён палічыў яе правакацыяй і пракаментаваў у не менш вострай форме: "*Запраўды, каб пісаць такую брахню не чырванеючы і, надрукаваўшы, не павесіцца са згрызоты, як Юда, трэба мець добрую школу 'drugiego wydziału' (...) Мэта гэтых даносаў і брахні для нас ясная: пры помачы абмовы накінуць здагону на адраджэнчы беларускі рух у Латвіі, ачарніць яго (…) іграючы на цемнаце і несвядомасці беларусаў каталікоў у Латгаліі*"[750].

Словы К. Езавітава не былі адзіным прыкладам: у беларускай прэсе хапала вострых публікацый пра латвійскіх палякаў. Найбольш пашыраным матывам антыпольскай рыторыкі было абвінавачванне ў паланізацыі беларусаў Латгаліі[751]. Аўтары тлумачылі адмоўнае стаўленне палякаў да беларускага руху ў Латвіі тым, што беларуская актыўнасць "перавярнула дагары нагамі ўсе польскія планы" далучэння Латгаліі да польскай дзяржавы[752]. Абурэнне латвійскіх беларусаў выклікала з'яўленне ў газеце "Dziennik Wileński" зацемкі пра тое, што ў Даўгаўпілсе адбыўся сход беларускіх прасавецкіх дзеячаў з Латвіі,

---

[747] Тамсама, s. 2.

[748] LMAB, f. 21/199, l. 1.

[749] К. Езавітаў, *Як польскія паны хацелі-б падзяліць Расію*, "Голас беларуса" 1926, № 17 ад 18 жніўня, с. 2.

[750] Крывічанін, *Адазваліся*, "Голас беларуса" 1926, № 28, с. 3.

[751] Кастусёнак, *Кракадзілавы сьлёзы*, "Голас беларуса" 1926, № 35; Кій, *Палякі ўсё яшчэ ня могуць забыцца аб Інфлянтах Польскіх*, "Голас беларуса" 1927, № 58, с. 1; *Паланізацыя ў Латвіі*, "Беларускае слова" 1931, № 1, с. 3; '*Для Латвійскай палоніі*', "Беларускае слова" 1931, № 1, с. 3.

[752] Паказальным у гэтым сэнсе быў артыкул К. Езавітава, які пісаў: "*Для польскіх паноў гэта была страшэнная нечаканка, скандальны правал усёй іх многагадовай працы па падрыхтоўцы далучэння Латгаліі да Польшчы (...) Вось чаму з такою нестрыманаю злосцю накінуліся палякі на правадыроў беларускага руху у Латвіі, вось чаму распушчалі і распушчаюць аб беларускім руху розную брахню, ды плачуць аб тым, што Латвійскі ўрад штучна стварае беларусаў у Латвіі, каб гэтым аслабіць польскія ўплывы ў Латгаліі і Ілукшчыне (...) Мы добра разумеем, што польскім панам беларускі рух, дзе б ён ні ішоў і ў чым бы не выяўляўся, – дужа коле вочы, бо беларускае сялянства праз беларускі нацыянальны рух і нацыянальнае самаўсведамленне перастае быць такімі 'хлопамі' (...) якімі так прывыклі камандаваць польскія памешчыкі*". Кастусёнак, *Кракадзілавы сьлёзы*, "Голас беларуса" 1926, № 35, с. 1.

Літвы, Польшчы і БССР, на якім, нібыта, латвійскія беларусы атрымалі грошы на антыдзяржаўную працу[753]. Па-за ўвагай беларускага латвійскага актыву не засталася зацемка ў віленскім выданні "Słowo" (№ 298 ад 23 снежня), дзе пісалася, што "саветы" не абмяжоўваюцца дэструктыўнай працай па падтрымцы ў левых партый, у тым ліку БСРГ, але таксама вядуць падрыўную працу ў Латвіі сярод латгальскіх беларусаў, за якую адказвае К. Езавітаў[754].

У той час, калі ў польскай прэсе пісалася пра беларускіх дзеячаў як прыхільнікаў і агентаў СССР, на старонках беларускіх выданняў з'яўляліся матэрыялы, аўтары якіх паказвалі дзейнасць мясцовых польскіх арганізацый як праяву антыдзяржаўнай і сепаратысцкай актыўнасці. У якасці прыкладу можна працытаваць "Голас беларуса": "*Ідэя аб тым, што Латгалія павінна зрабіцца зноў Польскімі Інфлянтамі – моцна засела ў галовах польскіх абшарнікаў. Яны спадзяюцца на тое, што 'здабыўшы Інфлянты' яны атрымаюць назад і свае вялікія маёнткі, якія цяперака, згодна зямельнай рэформы, ад іх адабраныя*"[755]. Аўтар звяртаў увагу на тое, што ў віленскай прэсе ўздымаецца пытанне наконт крыўды, якую, нібыта, учыніла латвійская дзяржава польскім буйным землеўласнікам. Ён лічыў небяспечнай сувязь мясцовых польскіх дзеячаў з польскімі дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі ў Латвіі, называючы дзейнасць апошніх падбухторваннем да сепаратызму[756]. У выданнях латвійскіх беларусаў можна прачытаць, што польскія школы ў Латвіі пашыраюць антылатвійскую прапаганду. Мясцовыя польскія грамадска-асветныя і культурныя арганізацыі называлі "гняздом польскага нацыяналізму". Асабліва падкрэслівалася шкоднасць Саюза палякаў у Латвіі, Польскага сельскагаспадарчага таварыства і газеты "Dzwon"[757]. Беларускія аўтары крытыкавалі спробы польска-латвійскага палітычнага збліжэння напрыканцы 1920-х гг.[758] У сваю чаргу, пагаршэнне адносін паміж Варшавай і Рыгай на пачатку 1930-х гг. выклікала энтузіязм беларускіх дзеячаў."Думка беларуса" з задавальненнем паведамляла пра стварэнне ў Сойме следчай камісіі, якая мела заняцца вывучэннем "антыдзяржаўнай" дзейнасці СПЛ[759].

Дадзеныя выказванні і цытаты сведчаць пра зацятасць і вастрыню дыскусіі. Абодва бакі выкарыстоўвалі кожную нагоду, каб выставіць апанентаў у адмоўным святле. Разам з тым, здараліся і асобныя выпадкі супрацоўніцтва.

---

[753] Кастусёнак, *Чарговая польская правакацыя*, "Голас беларуса" 1927, № 9 ад 25 траўня, с. 2.

[754] LVVA, 3235 f., 2 apr., 4635 l., 123, 130 lpp.

[755] Кій, *Палякі ўсё яшчэ ня могуць забыцца аб Інфлянтах Польскіх*, "Голас беларуса" 1927, № 58, с. 1.

[756] Кій, *Палякі ўсё яшчэ ня могуць забыцца аб Інфлянтах Польскіх*, "Голас беларуса" 1927, № 58, с. 1.

[757] *Паланізацыя ў Латвіі*, "Беларускае слова" 1931, № 1, с. 3.

[758] *Латвійска-польскі хаўрус праваліўся*, "Голас беларуса" 1927, № 54.

[759] *Ілукштанскі павет. Аб палёнізацыі*, "Думка беларуса" 1931, № 2, с. 2.

Напрыклад, 4 лютага 1932 г. прадстаўнікі Беларускага тэатральнага таварыства ў Латвіі В. Бароўская-Пігулеўская і Я. Камаржынскі ўдзялі ўдзел у святкаванні юбілею польскага тэатру[760].

Беларуска-рускія адносіны

Самай шматлікай нацыянальнай меншасцю ў міжваеннай латвійскай дзяржаве з'яўляліся рускія. Па працягу 1920–1935 гг. іх колькасць павялічылася з 91 477 да 206 499[761]. Належыць уважлівей прыгледзецца да сітуацыі з рускай меншасцю ў Латвіі. Руская супольнасць у латвійскай дзяржаве гістарычна падзялялася да дзве групы. Большую частку латвійскіх рускіх складалі аўтахтоны, месцам кампактнага пражывання якіх была Латгалія. Асабліва ў Лудзенскім і Рэжыцкім паветах адзначаўся значны працэнт насельніцтва, якое дэкларавала рускую нацыянальнасць. Гэта былі нашчадкі тых, хто апынуўся ў Латвіі ў выніку складаных міграцыйных працэсаў, якія адбываліся стагоддзямі. Самая шматлікая хваля міграцыі з Расіі ў Латвію назіралася ў сярэдзіне XVII ст., калі тут з'явіліся рускія стараверы, якія ўцякалі ад царскага пераследу. Акрамя аўтахтонаў, у Латвіі жылі рускія эмігранты. Гэта былі асобы, якія: 1) трапілі ў Латвію да 1918 г. (чыноўнікі, настаўнікі, вайскоўцы), 2) "белыя" рускія эмігранты, якія знайшлі прытулак над Даўгавай. Значная частка іх абрала ў якасці месца жыхарства Латвію, бо спадзявалася, што пасля паразы бальшавізму ў Расіі адсюль лягчэй будзе вярнуцца на бацькаўшчыну. Руская меншасць вызначалася значна большай сацыяльнай стракатасцю за беларускую. Акрамя сялянства, рускія ў Латвіі былі таксама прадстаўленыя значнай колькасцю рабочых, студэнтаў, прадпрымальнікаў, гандляроў, прадстаўнікоў культуры і навукі. Наяўнасць дастаткова шматлікай інтэлектуальнай і заможнай групы спрыяла грамадскай арганізаванасці і сацыяльнай мабільнасці рускай меншасці[762]. Руская супольнасць, якая пражывала ў Латвіі да 1918 г., стварыла зручную базу для пазнейшай хвалі эміграцыі, якая знайшла тут рускае асяроддзе з усёй неабходнай інфраструктурай: прэсай, арганізацыямі, клубамі, тэатрамі і г.д. "Белыя" эмігранты знайшлі ў Латвіі не толькі бяспечны прытулак, але і звыклы для сябе лад жыцця, які ім нагадваў дарэвалюцыйную рэчаіснасць[763].

---

[760] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 63 lp.

[761] *Centrā tautas skaitīšana Latvija 1935. gadā, IV tautība,* sastādījs: V. Salnītis, red. M. Skujenieks, Rīga 1937, s. 292.

[762] Гл.: К. Петроченко, *Русская диаспора в Латвийской Республике:1918–1940 гг.*, Автореферат на соискание научной степени кандидата исторических навук, Новосибирск 2006.

[763] *Голоса изгнанников. Периодическая печать эмиграции из советской России (1918–1945)*, сост. Й. Вацек и Л. Бабка, Прага 2009, с. 94.

У міжваеннай Латвіі дзейнічалі шматлікія грамадска-палітычныя, прафесійныя і культурна-асветныя арганізацыі, якія ставілі мэту захавання нацыянальнай ідэнтычнасці, культуры і роднай мовы[764]. Да іх ліку належалі створаныя на пачатку 1920-х гг. Рускі нацыянальны саюз, Рускі працоўны саюз і Нацыянальна-дэмакратычная партыя. У сярэдзіне 1920-х гг. узнікла Рускае нацыянальнае аб'яднанне. Мясцовая руская інтэлігенцыя вызнавала ідэалогію т.зв. дэмакратычнага нацыяналізму, якая аб'ядноўвала прынцыпы барацьбы за правы ўласнай культуры і мовы з маральна-прававымі прынцыпамі. Многія мясцовыя лідары бачылі ў ёй сродак захавання нацыянальнай культуры і мовы, але ў адпаведных умовах гэта ідэалогія магла быць выкарыстана і для пашырэння рускай вялікадзяржаўнай ідэі. Сярод рускіх дзеячаў Латвіі назіраліся вострыя супярэчнасці і нязгода[765].

Галоўнымі асяродкамі жыцця рускай меншасці былі гарады Рыга, Даўгаўпілс, Рэжыкнэ і Лудза. Там адзначалася значная колькасць рускіх – напрыклад, у латвійскай сталіцы яны складалі 7 – 8% жыхароў[766]. У органах самакіравання Рыгі і Латгальскай правінцыі засядалі прадстаўнікі рускай меншасці. Руская прысутнасць была заўважнай у медыяпрасторы міжваеннай латвійскай дзяржавы. Рускія перыядычныя выданні, якіх у краіне налічвалася некалькі дзясяткаў, займалі бачнае месца на газетна-часопісным рынку Латвіі, дзе сфармаваліся тры інфармацыйныя прасторы: латышская, нямецкая і руская. Латвійскую рускую прэсу ведалі далёка па-за межамі краіны. У якасці прыкладу можна прывесці газету "Сегодня", якая выходзіла ў перыяд з 1919 па 1940 гг. Высокі сацыяльны статус рускай мовы да 1918 г. быў адной з галоўных прычын таго, што рускую прэсу ахвотна чыталі прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей: латышы, габрэі, немцы, палякі. На паводзіны рускай супольнасці ўплываў рэлігійны фактар. Паводле веравызнання, латвійскія рускія падзяляліся на праваслаўных і старавераў. Апошнія былі герметычнай і ізаляванай групай: лічылі сябе рускімі па нацыянальнасці, але адмоўна ставіліся да ўсяго, што не належала да іх культуры. Гэта праяўлялася нават у непрыманні "свецкіх" рускіх школ, праваслаўнага рускага насельніцтва і духавенства[767].

Акрамя таго, паміж аўтахтонамі і эмігрантамі існавала розніца ў разуменні іх месца і ролі на латвійскім грамадска-палітычным і культурным

---

[764] Гл. больш падрабязна: Т. Фейгмане, *Русские общества в Латвии (1920–1940 гг.)*, Рига 1992.

[765] *История Латвии XX век*, Д. Блейере, И. Бутулис, А. Зунда и др., Рига 2005, с. 205, 206.

[766] *Centrā tautas skaitīšana Latvija 1935. gadā, IV tautība*, sastādījs: V. Salnītis, red. M. Skujenieks, Rīga 1937, s. 292.

[767] Гл. больш падрабязна: К. Петроченко, *Русская диаспора в Латвийской Республике: 1918–1940 гг.*, Автореферат на соискание научной степени кандидата исторических навук, Новосибирск 2006.

краявідзе. Аўтахтоны засяроджвалася на сваіх мясцовых справах, якія тычыліся захавання культуры, ідэнтычнасці і гаспадарчых інтарэсаў. "Белыя" ж эмігранты адчувалі сябе не нацыянальнай меншасцю, а арганічнай часткай паслякастрычніцкай антыбальшавіцкай эміграцыі на Захадзе. Яны ўдзельнічалі ў грамадска-палітычным жыцці рускай дыяспары, якая знаходзілася ў Цэнтральна-Усходняй і Заходняй Еўропе (Францыі, Чэхаславакіі, Польшчы, Германіі, на Балканах). Грунтам для супрацоўніцтва была ідэя антыбальшавіцкай барацьбы. Невыпадкова, у Латвіі дзейнічалі прадстаўніцтвы такіх вайскова-палітычных арганізацый, як Расійскі агульнавайсковы саюз і Брацтва рускай праўды[768]. Значная частка "белых" эмігрантаў не здолела знайсці сабе месца ў незалежнай Латвіі, разглядаючы яе як часовы прытулак на шляху да небальшавіцкай Расіі. Многія лідары рускага руху захоўвалі адмоўнае стаўленне да латвійскай дзяржавы, што выявілася з пачаткам II сусветнай вайны[769].

Кантакты паміж дзеячамі рускага і беларускага рухаў у Латвіі былі непазбежнымі, бо месцам кампактнага жыхарства абодвух нацыянальных груп з'яўлялася Латгалія. У правінцыі канцэнтравалася ¾ усіх рускіх і беларусаў Латвіі. У 1930 г. там пражывала ажно 148,5 тыс. рускіх (27,4% насельніцтва). Пры гэтым на Даўгаўпілшчыне яны складалі 19% жыхароў, на Лудзеншчыне – 27,8%, на Рэжыччыне – 27,9%, на Новалатгальшчыне – 42,9%. Аналіз вынікаў першых двух перапісаў насельніцтва ў Латвіі дазваляе меркаваць, што значная колькасць тых, хто падчас першага быў запісаны беларусам, праз пяць гадоў фігураваў ужо як рускі. Галоўным чынам "нацыянальная метамарфоза" тычылася жыхароў двух паветаў – Лудзенскага і Рэжыцкага.

Табліца 47. Змены колькасці беларусаў і рускіх у Лудзенскім і Рэжыцкім паветах паводле перапісаў насельніцтва ў 1920 і 1925 гг.

Нацыянальнасць	Лудзенскі павет 1920	Лудзенскі павет 1925	Рэжыцкі павет 1920	Рэжыцкі павет 1925
Беларусы	23 307	9 392	13 355	1 626
Рускія	11 564	20 207	25 746	40 009

Крыніца: *Otra tautas skaitišana Latvijā. 1925. gada 10. Februari,* M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1925.

Дачыненні паміж беларускімі і рускімі дзеячамі нагадвалі беларуска-польскія. Адзіным адрозненнем беларуска-рускага змагання за "душы і сэрцы" тутэйшай вёскі тое, што справа тычылася праваслаўных і стараверaў, а не

[768] П. Базанов, *Братство русской правды – самая загадочная организацыя русского зарубежья*, Москва 2013, с. 103.

[769] *История Латвии XX век*, Д. Блейере, И. Бутулис, А. Зунда и др., Рига 2005, с. 205–206.

каталікоў. Нягледзячы на запэўніванні рускіх актывістаў, што ўсе мясцовыя праваслаўныя і стараверы паводле нацыянальнасці рускія, рэчаіснасць выглядала інакш. Па-першае, былі асобы, якія свядома лічылі сябе беларусамі. Па-другое, нават тыя, хто падчас перапісаў дэкларавaў прыналежнасць да рускага народа, мелі праблемы з нацыянальнай тоеснасцю. Даследчыкі гісторыі рускай меншасці прызнаюць, што рускай супольнасці Латвіі была ўласцівая культурная дыферэнцыяцыя. Мясцовая інтэлігенцыя ў буйных гарадах актыўна займалася грамадска-палітычнай, эканамічнай і культурнай працай, але ўзровень грамадскай актыўнасці сялянскіх мас заставаўся нізкі[770]. Таму не толькі беларускія і польскія, але і рускія дзеячы мелі цяжкасці з нацыянальнай агітацыяй сярод тых, каго яны залічвалі да прадстаўнікоў свайго народа. Менавіта латгальскія праваслаўныя і стараверы з няпэўнай нацыянальнай ідэнтычнасцю з'яўляліся прадметам нацыянальна-культурнай экспансіі беларускіх і рускіх дзеячаў. Абодва бакі прыкладалі намаганні, каб залучыць іх у шэрагі сваіх арганізацый і школ.

Значная частка рускіх дзеячаў разглядала беларускую ідэнтычнасць у вялікадзяржаўных шавіністычных катэгорыях, згодна з якімі існаванне беларусаў як самастойнага народа адмаўлялася. Дзеячы рускіх арганізацый маглі пагадзіцца на выкарыстанне назвы "беларусы", але пры ўмове, што гэта форма расійскага рэгіяналізму. Многія з іх не ўспрымалі факту, што беларускасць з'яўляецца натуральнай з'явай і паўтаралі за польскімі ды некаторымі латгальскімі палітыкамі, што беларусы як народ гэта штучнае стварэнне латвійскага ўраду на патрэбы бягучай палітыкі. Некаторыя рускія дзеячы лічылі беларусаў неад'емнай часткай рускага народа, а беларускіх актывістаў – разбэшчанымі рамантыкамі, якія, выкарыстоўваючы недакладныя звесткі перапісаў, намагаюцца атрымаць датацыі ад латвійскай дзяржавы[771].

Інтарэсы рускага і беларускага нацыянальных рухаў перакрыжоўваліся ў грамадска-палітычнай і культурна-асветнай сферах. Галоўным полем для канфлікту была школьная справа. Руская меншасць раней распачала арганізацыю школ. Яшчэ напрыканцы 1919 г. быў створаны Рускі школьны аддзел у складзе Міністэрства асветы. Рускія школы былі значна больш развітымі і шматлікімі за беларускія. На пачатку 1920-х г. у падпрадкаванні Рускага школьнага аддзела знаходзілася 198 асноўных і 25 сярэдніх школ. У 1929/30 гг. у Латвіі ўжо налічваліся 224 рускія школы, у якіх працавала 817 настаўнікаў і вучылася 13 938 вучняў[772]. Акрамя таго, руская інтэлігенцыя парупілася пра стварэнне вышэйшай навучальнай установы. 16 кастрычніка 1921 г. пачалі

---

[770] К. Петроченко, *Русская диаспора в Латвийской Республике: 1918–1940 гг.*, Автореферат на соискание научной степени кандидата исторических навук, Новосибирск 2006.

[771] LVVA, 1632 f., 2 apr., 493 l., 171–172 lpp.

[772] AAN, sygn.: MSZ, t. 5290, Raport pt. Mniejszości narodowe na Łotwie, 1 III 1929 r.

працу Рускія ўніверсітэцкія курсы, якія ў 1930 г. былі ператвораныя ў Рускі інстытут універсітэцкіх ведаў. Апрача гэтага, у 1926 г. з мэтай падрыхтоўкі настаўнікаў у Рызе былі створаныя Дзяржаўныя рускія настаўніцкія курсы, а годам пазней у Рэжыкнэ – Дзяржаўны рускі настаўніцкі інстытут[773].

З'яўленне беларускіх школ было сапраўдным громам з яснага неба для рускіх дзеячаў. Рэакцыю апошніх на загад пра стварэнне восенню 1921 г. Беларускага школьнага аддзела яскрава перадае фельетон М. Бараноўскага пад назвай *Школьная инициатива белорусского самоопределения*: "*Няпэўнае панылае пачуцце перад нейкай няўлоўнай недарэчнай сілай, навязлівай бязглуздзіцы, змяшанай з няпэўнасцю ў заўтрашнім дні, што прыгнятае свядомасць, і глумленнем над здаровым сэнсам – вось у агульных рысах адлюстраванае ўражанне, зробленае гэтым загадам у настаўніцкіх колах*"[774]. Ва ўяўленні многіх прадстаўнікоў мясцовай рускай інтэлігенцыі існаванне школ з навучаннем "на белорусском наречии" з'яўлялася недарэчным. Аўтар вышэйзгаданага фельетона адзначаў, што ў працэсе культурнага і духоўнага сталення беларусы не могуць задаволіцца "доморощенным языком предков", таму імкнуцца "к общению с лучшими представителями русской мысли", што знаходзіць адлюстраванне ў жаданні карыстацца рускай літаратурнай мовай, якая з'яўляецца адзіным сродкам захавання сваіх духоўных каштоўнасцей. Далей аўтар пісаў: "*У сваім фанатычным захапленні няздзейсненымі хімерамі, у бязглуздым імкненні ісці насуперак натуральнаму парадку рэчаў, апалагеты беларускага адраджэння не завагаліся перад тым, каб скласці ў ахвяру сваім імглістым мроям жывое цела народнай асветы*"[775]. Аўтар аспрэчваў права латвійскіх беларусаў на культурную аўтаномію, называючы яе штучнай з'явай, прыдуманай "беларускімі сепаратыстамі" і "беларусафіламі"[776].

Нацыянальны склад вучняў школ, падначаленых Рускаму школьнаму аддзелу, быў стракаты. Акрамя рускіх, іх наведвалі вучні іншых нацыянальнасцей, бацькі якіх жадалі, каб дзеці атрымлівалі асвету на рускай мове, сацыяльны статус якой быў высокі. Напрыклад, у 1924/25 гг. на 2 139 вучняў рускіх сярэдніх школ толькі 390 складалі рускія. Астатнімі былі: габрэі – 1 318, латышы – 214, немцы – 124, палякі – 86, беларусы – 7[777]. Рускія дзеячы ахвотна бачылі ў мурах сваіх навучальных устаноў дзяцей беларусаў. Прысутнасць апошніх разглядалася як натуральная з'ява, паколькі беларусаў яны разглядалі як частку рускай этнакультурнай прасторы. Ад пачатку

---

[773] С. Цоя, *К истории русского образования в межвоенной Латвии (20–30-е годы XX в.)* [в:] *Альманах. Вып. XXXVI. Русский мир и Латвия: смена времен*, ред. Мазур С.А. Рига 2014, с. 81.

[774] LVVA, 1632 f., 2 apr., 493 l., 155 lp.

[775] LVVA, 1632 f., 2 apr., 493 l., 166 lp.

[776] LVVA, 1632 f., 2 apr., 493 l., 172 lp.

[777] LVVA, 2125 f., 1 ap., 45 l., 25 lp.

існавання Рускага школьнага аддзела ў яго падпарадкаванні апынуліся школы ў валасцях з беларускім насельніцтвам. У 1921/22 гг., калі пачаў працу Беларускі школьны аддзел, ён запатрабаваў перадаць у сваё распараджэнне школы ў мясцовасцях, дзе, паводле перапісу 1920 г., дамінавалі беларусы. 4 кастрычніка 1922 г. кіраўніцтва БША звяртала ўвагу інспектара К. Езавітава на тое, што ў многіх рускіх школах у Даўгаўпілскім, Лудзенскім і Рэжыцкім паветах шмат вучняў-беларусаў, а ў некаторых яны складаюць большасць. Латвійскія ўлады ішлі насустрач беларускім дзеячам. Першыя беларускія школы ў Даўгаўпілскім і Лудзенскім паветах, якія пачалі працу ў 1921/22 гг., раней падпарадкоўваліся Рускаму школьнаму аддзелу[778]. Найбольш школ перайшло ў падпарадкаванне БША ў студзені і лютым 1922 г.[779]

Такім чынам, сетка беларускіх пачатковых школ у Латгаліі стваралася коштам мясцовых рускіх адукацыйных устаноў. Гэта выклікала вострую крытыку з боку прадстаўнікоў рускага лагера. Асабліва зацятая барацьба ішла ў мясцовасцях, дзе побач існавалі школы гэтых двух нацыянальнасцей. Здаралася, што дзеці з адной сям'і навучаліся ў розных нацыянальных школах: адно – у рускай, а другое – у беларускай[780]. З'яўленню "спрэчных" школ спрыяў нізкі ўзровень нацыянальнай свядомасці беларускамоўнага праваслаўнага сялянства, якое, кіруючыся рэлігійнай прыкметай, часамі атаясамлівала паняткі "рускі" і "беларускі". У выніку ўзнікалі сітуацыі, калі, згодна з перапісам насельніцтва 1920 г., вёска лічылася беларускай, але яе жыхары называлі сябе рускімі паводле веры. Латвійскія школьныя ўлады перадавалі гэтыя школы ў распараджэнне БША, але ў школьнай дакументацыі вучні фігуравалі як рускія. Як адзначалася раней, заканадаўства аб асвеце нацыянальных меншасцей давала магчымасць рознай інтэрпрэтацыі закона і стварала адвольнасць у вызначэнні нацыянальнай прыналежнасці школ. Згодна з законам, запіс дзіцяці ў школу залежаў не толькі ад волі бацькоў, але і ад здольнасці вучня фармуляваць думкі на той ці іншай мовы. Беларускі школьны аддзел звяртаў увагу кіраўнікоў школ, каб падчас вызначэння нацыянальнасці вучняў кіраваліся моўным, а не рэлігійным, крытэрыем. Аднак выканаць даручэнне не заўсёды было проста. У снежні 1921 г. кіраўнік Галышаўскай школы (Лудзенскі павет) пісаў, што школу наведвае 107 вучняў праваслаўнага веравызнання, але падзяліць іх на "велікарусаў і беларусаў" немагчыма, бо яны не размаўляюць на чыста рускай альбо беларускай мовах[781]. З мэтай высвятлення нацыянальнай сітуацыі ў беларускіх школах 17 красавіка 1923 г. кіраўнік БША выдаў цыркуляр дырэктарам школ (Пітэрскай, Брыгаўскай,

[778] LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 25 lp.

[779] К. Езавітаў, *Становішча беларускае школы ў Латвіі*, Вільня 1923, с. 15.

[780] LVVA, 2125 f., 5 apr., 256 l., 73 lp.

[781] LVVA, 2125 f., 5 ap., 68 l., 7 lp.

Мала-Слабадской, Цуцуркаўскай і інш.), у якім адзначалася, што ў графе "нацыянальнасць вучня" належыць пазначаць "baltkrievu", а не "krievu"[782]. Аднак не заўсёды распараджэнне выконвалася. Так, у студзені 1924 г. кіраўніцтва БША патрабавала ад кіраўніка Брадайжскай школы выправіць нацыянальнасць вучняў, бо ў дакументацыі па-ранейшаму было адзначана, што школу наведвае 18 рускіх і толькі 1 беларус[783].

Рускія дзеячы вялі ў прэсе кампанію супраць беларускай школьнай справы. У газеце "День" у 1922 г. з'явіўся артыкул *Школьное дело в Латвии*, аўтар якога пад псеўданімам "Латгалец" у адмоўным святле паказаў беларускую школьную справу. Беларускія дзеячы рэагавалі на выступы нядобразычліўцаў[784]. У 1923 г. у штомесячніку Міністэрства асветы "Izglitibas Ministrijas Menesraksts" (№ 1) выйшаў артыкул К. Езавітава *Аб беларусах і вялікарусах у Латвіі* з крытыкай рускіх дзеячаў, якія ідуць за царскай традыцыяй і лічаць беларусаў, украінцаў і вялікарусаў адным народам[785].

За словамі рускіх дзеячаў ішлі ўчынкі. Рабіліся практычныя крокі з мэтай пазбавіць беларусаў школ, якія рускія лічылі сваімі. Беларускія крыніцы інфармавалі пра выпадкі запалохвання настаўнікаў беларускіх школ. У архіве БША захоўваюцца лісты педагогаў, якія скардзіліся на тое, што іх рускія калегі пашыралі на Даўгаўпілшчыне чуткі, што ўсе беларускія школы ў хуткім часе будуць зачынены, а іх настаўнікі звольнены. У сувязі з гэтым ім прапаноўвалася перайсці ў рускія школы[786]. Складана вызначыць маштаб такіх дзеянняў, але захавалася шмат архіўных крыніц, якія сведчаць пра беларуска-рускае змаганне за школы. Варта разгледзець канкрэтныя інцыдэнты.

Рускія актывісты намагаліся заблакіраваць працэс арганізацыі беларускіх школ, выкарыстоўваючы соймавую трыбуну. Дэпутат рускай меншасці Уладзімір Праснякоў падтрымаў латгальскага дэпутата Францісса Кэмпса, які аспрэчваў мэтазгоднасць існавання беларускай школьнай аўтаноміі. Падчас дыскусіі рускі дэпутат адзначыў, што БША кепска разумее сваю ролю і стварае беларускія школы, перарабляючы з рускіх і завабліваючы туды вучняў на працягу навучальнага года. На гэту заўвагу прадстаўнік Міністэрства асветы Валерыя Сейле адзначыла, што, нягледзячы на тое, што ў іншых краінах беларусы не прызнаюцца як нацыя, у Латвіі яны існуюць. У адказ на гэта рускі дэпутат-старавер Фёдар Паўлаў падкрэсліў, што беларускімі школамі могуць лічыцца толькі тыя, у якіх навучанне адбываецца на беларускай

---

[782] LVVA, 2125 f., 5 ap., 68 l., 10 lp.

[783] LVVA, 6845 f., 2 ap., 4 l., 91 lp. Заслугоўвае ўвагі тое, што ў 1922/23 гг. у школе на 73 вучні небеларусамі былі пазначаны толькі 8 (2 чэхі, 2 праваслаўныя і 1 каталік латыш, 1 паляк і 1 габрэй) (LVVA, 2125 f., 5 apr., 34 l., 9 lp.).

[784] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 46, л. 10–11.

[785] АБНР, т. 1, кн. 2, с. 1387.

[786] LVVA, 2125 f., 5 apr., 212 l., 29 lp.

мове[787]. У сувязі з антыбеларускім дэмаршам рускіх дэпутатаў, Лудзенскі аддзел таварыства "Бацькаўшчына" скіраваў пратэст на імя старшыні заканадаўчага органу, у якім заявы У. Праснякова і Ф. Кэмпса называліся варожымі і шкоднымі[788]. 28 чэрвеня 1922 г. удзельнікі летніх беларускіх настаўніцкіх курсаў накіравалі ўласны пратэст на імя старшыні латвійскага парламента[789]. У 1922 г. падчас абмеркавання ў парламенце бюджэту для школ нацыянальных меншасцей 3 з 4 дэпутатаў-рускіх спрабавалі заблакіраваць бюджэт для БША. У 1923 г. сітуацыя зноў паўтарылася. Дэпутаты рускі Пётр Карэцкі і латгалец Язэпс Трасунс (малодшы) пераконвалі, што ў Лудзенскай беларускай школе няма беларусаў, а навучанне вядзецца па-руску[790]. У лютым 1923 г. настаўнік Рунданскай школы (Істэрская воласць Лудзенскага павета) пісаў К. Езавітаву пра візіт у воласць дэпутата П. Карэцкага, які прыехаў па запрашэнні тых "*з гаспод, якія не могуць ніяк пераварыць слова 'беларус'*". На сустрэчы з насельніцтвам дэпутат заклікаў сялян падтрымаць рускіх палітыкаў і ігнараваў прысутнасць беларусаў[791]. 22 сакавіка 1925 г. палітык наведаў Прыдруйскую воласць і падчас сустрэчы з насельніцтвам абрынуўся на беларускія школы. Ён заявіў, што хутка беларусы будуць пазбаўленыя культурнай аўтаноміі, таму іх школы будуць зачыненыя. Ён заклікаў мясцовае насельніцтва парупіцца пра ператварэнне беларускіх школаў у рускія, інакш яны стануць латышскімі[792].

У архіве Беларускага школьнага аддзела захавалася шмат сведчанняў таго, як выглядала беларуска-рускае змаганне за школы ў гарадах і ў правінцыі. У Лудзы ў лютым 1922 г. дзеячы таварыства "Бацькаўшчына" звярталі ўвагу К. Езавітава на тое, што ў горадзе пачынаюць гучаць галасы з патрабаваннем вярнуць мясцовую беларускую пачатковую школу ў Рускі школьны аддзел. Інспектара К. Езавітава прасілі прыехаць у Лудзу на пасяджэнне павятовай школьнай управы і сустрэцца з мэрам горада – латышом, які можа паспрыяць беларускай справе[793]. У горадзе існавала гімназія, за якую змагаліся беларускія і рускія дзеячы. Трывогу ў Рускага школьнага аддзела выклікалі весткі пра намер БША адчыніць на яе базе беларускую прыватную гімназію таварыства "Бацькаўшчына"[794]. Тым часам беларускі бок намагаўся

---

[787] *Государственный бюджет 1921–22*, "Русский курьер" № 357 от 2 марта 1922 г., с. 1.

[788] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 42, л. 2.

[789] LVVA, 2125 f., 5 ap., 104 l., 7 lp.

[790] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 110, л. 19; К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, Рыга 1927 [перадрук: Нью Ёрк – Менск 2013], с. 70–71; К. Езавітаў, *Становішча беларускае школы ў Латвіі*, Вільня 1923, с. 18.

[791] LVVA, 2125 f., 5 apr., 200 l., 65 lp.

[792] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 80, л. 28.

[793] LVVA, 2125 f., 5 ap., 69 l., 54 lp.

[794] LVVA, 2125 f., 5 apr., 256 l., 73 lp.

заблакіраваць ператварэнне гімназіі ў рускую. У красавіку 1922 г. К. Езавітаў пісаў С. Сахараву: "*Сярэдняй расейскай школы ў Люцыну не павінна быць. І трэба зрабіць усё, каб яна не была адчынена, бо гэта павядзе да зусім непажаданых трэній з расейцамі і да лішняй барацьбы ў будучыні*"[795].

19 кастрычніка 1922 г. прадстаўнік рускай грамадскасці горада сустрэўся з міністрам асветы Латвіі. Апошні катэгарычна выказаўся, што ў Лудзы можа быць толькі адна сярэдняя школа – руская альбо беларуская. Рускі бок прапанаваў стварыць змяшаную беларуска-рускую гарадскую гімназію пад агульным кіраўніцтвам. Навучанне ў ёй вялося б на рускай мове, але для вучняў-беларусаў былі прадугледжаныя прадметы беларусазнаўства і беларускай мовы[796]. Каб выпрацаваць супольную пазіцыю ў гэтай справе, 20–22 верасня 1922 г. у Лудзы была скліканая беларуска-руская камісія прадстаўнікоў Беларускага і Рускага школьных аддзелаў, таварыства "Бацькаўшчына", арганізацыйнага камітэта па стварэнні рускай гімназіі. Беларускі бок прадстаўлялі С. Сахараў, К. Езавітаў і Р. Плыгаўка. На пасяджэнні К. Езавітаў папікнуў прадстаўнікоў рускай меншасці ў гарадской думе, што яны, замест таго, каб па-братэрску дамовіцца з беларусамі наконт стварэння пры беларускай гімназіі двух рускіх класаў, пачалі тарпедаваць мясцовую беларускую пачатковую школу, пазбаўляючы яе матэрыяльнага забеспячэння. Дзеяч прапанаваў, каб руская меншасць паўплывала на сваю фракцыю ў гарадской думе ў пытанні перадачы беларускай школе асобнага будынка. Ён запэўніў, што калі ўмова будзе выканана, тады беларусы пагодзяцца на перайменаванне гімназіі ў "Беларуска-рускую"[797]. Аднак рознагалоссі выклікала пытанне далейшага падпарадкавання ўстановы. Беларусы сцвярджалі, што ўласнікам павінна надалей быць таварыства "Бацькаўшчына", а рускія выказваліся за перадачу гімназіі гораду[798]. Напружанне паміж беларусамі і рускімі дзеячамі спрабаваў улагодзіць І. Краскоўскі[799].

---

[795] LVVA, 2125 f., 5 apr., 38 l., 75 lp.

[796] LVVA, 2125 f., 5 ap., 247 l., 13 lp.

[797] LVVA, 2125 f., 5 ap., 247 l., 38 lp.

[798] LVVA, 2125 f., 5 ap., 247 l., 49 lp.

[799] 30 кастрычніка 1922 г. І. Краскоўскі звярнуўся да кіраўніцтва Рускага школьнага аддзела з наступным лістом: "*Препроваждая при сем постановление от 21 октября с.г. белорусская гимназия в г. Люцине Правление Белорусского о-ва Батьковщина вместе с тем льстит себя надеждой, что разрешение этого вопроса, как оно проведено в пригалаемом постановлении, в духе полюбовного разграничения сфер культурно-национального дела братских славянских народов – великороссов и белоруссов дальнейшему укреплению совместной работы на общей ниве нашего культурно-национального прогресса. Искренние сочувствуя успехам дела культурного развития братьев великороссов, мы не сомневаемся в столь же благожелательном отношении и со стороны великороссов к делу нашего белорусского возрождения*". LVVA, 2125 f., 5 apr., 374 l., 2 lp.

У рэшце рэшт, таварыства "Бацькаўшчына" і БША адмовіліся ад планаў супольнай школы і палічылі патрэбным, каб у Лудзы існавала толькі беларуская гімназія. На момант перадачы гімназіі ў распараджэнне БША нацыянальны склад вучняў быў мяшаны, але з перавагай беларусаў. Пры гэтым беларусы мелі выразную перавагу ў двух малодшых класах (1-ы клас: беларусы – 19, рускія – 6, палякі – 8, літоўцы – 1; 2-гі клас: беларусы – 16, рускія – 4, палякі – 1). Каб пазбегнуць абвінавачанняў у прымусовай беларусізацыі вучняў-небеларусаў, 21 кастрычніка 1922 г. кіраўніцтва таварыства "Бацькаўшчына" прапанавала даць ім магчымасць скончыць школу як рускую, перадаючы два старэйшыя класы ў распараджэнне Рускага школьнага аддзела, а вучняў-беларусаў перавесці адтуль у Даўгаўпілс[800]. Урэшце, было вырашана, што школа будзе беларускай з магчымасцю часовага існавання двух (старэйшых) рускіх класаў[801]. 22 лістапада 1922 г. Рада Рускага школьнага аддзела звярнулася да дэпутатаў рускай меншасці ў Сойме, каб яны дапамаглі разабрацца ў сітуацыі. Захады не прынеслі жаданага выніку[802].

Беларуска-рускі школьны канфлікт не абмінуў Даўгаўпілса. У кастрычніку 1922 г. Рада Рускага школьнага аддзела прызначыла дадатковую дапамогу для незаможных вучаніц Даўгаўпілскай гарадской рускай жаночай гімназіі, паколькі з'явілася небяспека, што яны пачнуць пераходзіць у мясцовую беларускую гімназію. На думку рускіх дзеячаў, беларусы вабяць да сябе вучняў рознымі палёгкамі і абяцаннямі. Рада Рускага школьнага аддзела баялася, што ў выніку беларускай дзейнасці ў рускай гімназіі застануцца толькі вучаніцы-габрэйкі, што створыць пагрозу перадачы яе ў распараджэнне Габрэйскага школьнага аддзела[803]. У лютым 1924 г. на пасяджэнні гарадской школьнай управы разглядалася справа перайменавання 2-й Даўгаўпілскай рускай асноўнай школы ў беларускую, паколькі большасць вучняў складалі беларусы. Тым часам, рускія дзеячы лічылі, што беларускія актывісты свядома ўводзяць з зман бацькоў вучняў, якія дакладна не ведаюць розніцы паміж беларусамі і рускімі[804]. Восенню 1925 г. група бацькоў-беларусаў Даўгаўпілса звярнулася ў мясцовую гарадскую школьную ўправу з прапановай адчыніць у горадзе 2-ю беларускую пачатковую школу[805]. Аднак справа цягнулася гадамі. 1 верасня 1931 г. у часе пасяджэння Даўгаўпілскай гарадской школьнай управы абмяркоўвалася стварэнне ў горадзе 2-й беларускай пачатковай школы на Старым Фарштаце. Супраць гэтых планаў рашуча выказаліся

---

[800] LVVA, 2125 f., 5 ap., 247 l., 37 lp.

[801] LVVA, 2125 f., 5 ap., 247 l., 27, 29 lpp.

[802] LVVA, 2125 f., 1 ap., 44 l., 3 lp.

[803] LVVA, 2125 f., 1 ap., 43 l., 86 lp.

[804] LVVA, 1612 f., 14 apr., 10 l., 29 lp.

[805] *Беларусы у Латвіі*, "Голас беларуса" 1925, № 17 ад 20 лістапада, с. 4.

прадстаўнікі рускай і польскай меншасцяў. Ананімны аўтар на старонках беларускай прэсы адзначаў, што яны "*яшчэ раз даказалі, што інтэлігент расееец і паляк да гэтага часу варожа адносяцца да духовых патрэб беларуса і трымаюцца да яго свайго вялікадзяржаўнага шавіністычнага погляду*"[806].

Не меншыя эмоцыі, звязаныя з барацьбой за нацыянальную прыналежнасць школ, назіраліся ў латгальскай правінцыі. У Лудзенскім павеце беларуска-рускія школьныя непаразуменні пачаліся ўвесну 1922 г. Рускія дзеячы намагаліся паралізаваць працэс стварэння беларускіх школ паводле наступнай схемы: склікаўся сход бацькоў і сяброў школьнай рады, на якім прымаліся пратэст супраць далейшага знаходжання школы ў падпарадкаванні БША і зварот у Рускі школьны аддзел з просьбай ператварыць школу ў рускую. 14 студзеня 1922 г. парафіяне Гальшэўскай царквы на сходзе выказаліся супраць знаходжання Ляўзінскай школы ў падпарадкаванні БША. У выніку 15 сакавіка 1922 г. Лудзенская школьная павятовая ўправа перайменавала школу ў рускую і даручыла яе Рускаму школьнаму аддзелу[807].

22 красавіка педагагічная рада Дэглеўскай беларускай школы паведаміла Рускаму школьнаму аддзелу пра жаданне перайсці ў яго падпарадкаванне. Матывы былі наступныя: 1) жыхары Дэглеўскай воласці лічаць сябе рускімі; 2) паводле веравызнання яны праваслаўныя; 3) беларуская мова для іх чужая; 4) сярод 64 вучняў 62 залічваюць сябе да рускіх[808]. Справай зацікавіўся БША, кіраўнік якога аспрэчыў вышэйзгаданыя пастулаты: паводле перапісу насельніцтва, большасць жыхароў вёскі складаюць праваслаўныя беларусы, якім беларуская мова не можа быць чужой. Пераконваючы кіраўніцтва школы, С. Сахараў выкарыстоўваў гістарычныя ("шматвекавая русіфікацыя і патрэба адраджэння беларускай культуры") і рэлігійныя ("праваслаўе не азначае рускую нацыянальнасць") аргументы[809].

28 красавіка 1922 г. школьныя рады Даглеўскай і Рэстмуйжскай школ (Пылдзенская воласць) прынялі рашэнне ператварыць іх у рускія. 2 траўня 1922 г. у Рускі школьны аддзел паступіла хадайніцтва ад Рады і бацькоў Рэстмуйжскай школы[810]. У кастрычніку 1922 г. Рускі школьны аддзел інфармаваў БША, што школьная рада Дэглеўскай школы запатрабавала ператварыць установу ў рускую (аргументы пададзеныя вышэй)[811]. 12 кастрычніка 1922 г. БША паведаміў, што не бачыць падстаў для перадачы вышэйзгаданых школ Рускаму школьнаму аддзелу. У адказ рускі бок звярнуўся да міністра

---

[806] *Змаганьне за беларускую школу*, "Думка беларуса" 1931, № 3, с. 4.

[807] LVVA, 2125 f., 5 ap., 39 l., 87 lp.

[808] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 45, л. 9.

[809] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 45, л. 11.

[810] LVVA, 2125 f., 5 ap., 39 l., 87 lp.

[811] LVVA, 2125 f., 5 ap., 39 l., 77 lp.

асветы. Кіраўнік Рускага школьнага аддзела бачыў выйсце ў стварэнні мяшанай камісіі, якая павінна заняцца высвятленнем нацыянальнага складу бацькоў і вучняў у спрэчных школах[812].

Кіраўніцтва БША намагалася пераканаць бацькоў, каб яны не пратэставалі супраць беларускіх школ. 23 лістапада 1922 г. Беларускі школьны аддзел накіраваў на адрас школьнай рады Рэстмуйжскай школы ліст наступнага зместу: "*В ответе на постановление собрания родителей учащихся от 7 ноября с.г. по вопросу о национальности детей, Белорусское Управление считает долгом указать Школьному Совету на нижеследующее: 1) Искони веков в южной части Люцинского уезда жило национальное белорусское меньшинство, подтверждение чего можно найти в каждом учебнике географии; великорусское население было здесь лишь прышлым населением и в незначительном количестве. 2) Действительно, под многовековым великорусским влиянием, которое воспитывало презрение к белорусскому языку как к 'мужицкому', белорусское население начало стесняться своих этнографических особенностей. 3) Но все-таки эти особенности остались в населении, есть они и в Пылденской волости, в состав которой входит и деревня Русские Горбуны и выражаеться в народной поэзии, народной речи и народном быте. 4) При новых условиях жизни эти особенности ни в коем случае нельзя подавлять, ведь и поляки, и немцы, и евреи и др. – все держатся крепко за свое родное. 5) Подобных школ, как Русско-Горбуновская, где население в большой степени поддалось великорусскому влиянию, есть несколько, и в таких школах Белорусское Управление не собирается производить коренной ломки в смысле языка преподавания, тем более, что белоруссы не чуждаются русского языка, и всегда Белорусское Управление будет считаться с голосом населения. В таких школах Белорусское Управление предлагает к обязательному введению в курс предметов лишь предмет белоруссоведения, белорусский же язык может быть введен в школу в виде изучения изучения отдельных белорусских стихотворений, песен и игр и, конечно, это зависит от умения и желания педагогического персонала (...) Ввиду сего, Белорусское Управление предлагает Школьному Совету еще раз собрать в ближайшее время родителей и обсудить названный вопрос ввиду важности его и предложить собранию для обсуждения следующий проект постановления, в изменение предшествующих постановлений. 1) Русско-Горбуновская школа именуется и дальше белорусскою. 2) Принимая во внимание местные особенности, предложить преподавание в школе на русском языке. 3) Ввести в курс школы предметы белоруссоведения. 4) Знакомство с белорусским языком ввести в школу в виде изучения доступных детям белорусских песен, стихотворений, игр и проч.*"[813].

[812] LVVA, 2125 f., 5 ap., 39 l., 87 lp.

[813] LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 36 lp.

Пад уплывам мясцовага дзеяча Нацыянальна-дэмакратычнага саюза Анісімава частка бацькоў Стара-Слабодскай школы (Істэрская воласць) падала заяву ў БША пра перадачу школы ў падпарадкаванне Рускага школьнага аддзела. 19 лістапада 1922 г. адбыўся сход бацькоў і настаўнікаў школы (разам 56 чал.). Удзельнікі нагадалі, што бацькі ў свой час выказаліся за ператварэнне рускай школы ў беларускую, але пры ўмове захавання ранейшых парадкаў. А Беларускі школьны аддзел, насуперак абяцанням, увёў прадметы па беларускай мове і беларусазнаўстве (па тры гадзіны на тыдзень)[814]. Прысутныя прынялі пастанову пра тое, што "*беларуская мова, апроч страты навучальнага часу як у школе, так і падчас падрыхтоўкі дзяцей да ўрокаў дома, нічога не дае. Насельніцтва ім не карыстаецца, і размоўная мова толькі руская, таму беларуская мова ў гэтых абставінах можа служыць толькі тормазам да правільнага вывучэння літаратурнай рускай мовы*"[815]. Сход прыняў рашэнне звярнуцца да Лудзенскай павятовай школьнай управы з просьбай ператварыць школу з беларускай у рускую[816]. Заслугоўвае ўвагі факт, што восенню 1922 г. у школе былі толькі чатыры вучні латышскай нацыянальнасці. Усе астатнія – праваслаўныя беларусы[817].

Тым часам кіраўніца Вертулаўскай школы (Рунданская воласць), Лельмож пачала сярод сялян збор подпісаў за перадачу школы Рускаму школьнаму аддзелу. 27 верасня 1922 г. з яе ініцыятывы адбыўся бацькоўскі сход, на якім настаўніца пераконвала, што навучанне па-беларуску дзецям непатрэбнае. Каб улагодзіць сітуацыю, на месца выехаў настаўнік Пётр Клявінь. Пасля размоваў з настаўнікамі і бацькамі высветлілася, што апошнія не мелі выразнага меркавання, на якой мове павінны вучыцца іх дзеці[818].

Латвійскія ўлады былі вымушаны рэагаваць на такія сітуацыі. Лудзенская павятовая школьная ўправа стварыла камісію з двух латышоў і аднаго рускага, якая наведала шэсць беларускіх школ на Лудзеншчыне і сустрэлася з настаўнікамі і бацькамі. 20 снежня 1922 г. Лудзенская павятовая школьная ўправа пастанавіла вывесці з падпарадкавання БША тры школы (Рэстмуйжскую, Стара-Слабадскую, Вертулаўскую) і перадаць іх у Рускі школьны аддзел. Гэта рашэнне было прынята ў выніку галасавання з вынікам 7 супраць 1 (адзіным, хто выступіў супраць, быў інспектар К. Езавітаў)[819]. Падставай для такога рашэння былі вынікі працы вышэйзгаданай камісіі. К. Езавітаў не здолеў пераканаць прысутных пакінуць школы ў падпарадкаванні Беларускага школьнага аддзела[820].

---

[814] LVVA, 2125 f., 5 ap., 39 l., 65 lp.

[815] LVVA, 2125 f., 5 apr., 38 l., 65 lp.

[816] Тамсама.

[817] LVVA, 2125 f., 5 apr., 34 l., 3–6 lpp.

[818] LVVA, 2125 f., 5 ap., 40 l., 13, 15–19 lpp.

[819] LVVA, 2125 f., 5 ap., 39 l., 76 lp.; LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 67 lp.

[820] LVVA, 2125 f., 5 apr., 38 l., 76 lp.

Адметна, што, паводле статыстычных звестак, на 1921/22 гг. у ніводнай з вышэйзгаданых школ, перададзеных Рускаму школьнаму аддзелу, вучні рускай нацыянальнасці і праваслаўныя не складалі большасці[821]. Заслугоўвае таксама ўвагі факт, што Лудзенская павятовая школьная ўправа вырашыла перадаць у Рускі школьны аддзел Рэстмуйжскую беларускую школу нягледзячы на тое, што раней (19 лістапада 1922 г.) бацькоўскі сход выказаўся за тое, каб захаваць яе ў юрысдыкцыі БША. Рускі школьны аддзел лічыў, што большасць вучняў школы складаюць рускія (50 з 65). Дзеля праверкі гэтых звестак яшчэ ў верасні 1922 г. С. Сахараў наведаў школу і сустрэўся з мясцовымі сялянамі. У выніку размовы высветлілася, што яны нічога не маюць супраць беларускай школы. Адзінымі прыхільніцамі пераходу школы ў распараджэнне Рускага школьнага аддзела з'яўляліся дзве настаўніцы-рускія[822].

Аналізуючы вышэйзгаданыя сітуацыі, трэба памятаць, што звароты школьнай дырэкцыі і бацькоў пра перавод школ у Рускі школьны аддзел не адлюстроўвалі сапраўдных настрояў жыхароў, якія нярэдка былі непісьменнымі. У некаторых вёсках (напрыклад, у Старой Слабадзе) бацькі спачатку патрабавалі стварэння беларускай школы, а праз колькі месяцаў выказвалі жаданне ператварыць яе ў рускую. У большасці выпадкаў петыцыі з патрабаваннем змены нацыянальнай юрысдыкцыі школ складалася пад уплывам мясцовай рускай інтэлігенцыі. Невыпадкова, сярод ініцыятараў склікання сходаў былі праваслаўныя святары і настаўнікі, якія атрымалі педагагічную адукацыю ў царскай Расіі[823]. Прадстаўнікі беларускага актыву добра пра гэта ведалі. Актывіст з Лудзы пісаў: "*Вачавідна, што тут адчуваецца старонні ўплыў, тым болей, што ў самой школцы ня было вытворана карэнных ломак, а затым не магло быць і поваду к бацькоўскаму перарашэнню*"[824]. Кіраўніцтва БША тлумачыла выступленні бацькоў супраць беларускіх школ падбухторваннем рускіх дзеячаў і палітыкаў, якія пры падтрымцы невялікай часткі па-антыбеларуску настаўленага настаўніцтва ("*не звязанага з мясцовым краем, не будучы беларускай нацыянальнасці, стаяла ў апазіцыі да беларускай школы, працуючы ў ёй як змяя за пазухай*") ініцыююць петыцыі супраць беларускіх школ[825].

Як ужо адзначалася (раздзел II), у першыя гады існавання беларускай школьнай справы яе слабым месцам быў педагагічны склад. У школьных мурах не хапала настаўнікаў–ідэйных беларусаў. Старыя настаўнікі абыякава,

---

821 LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 37 lp.

822 НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 45, л. 2, 10–10 зв.

823 LVVA, 2125 f., 5 apr., 34 l., 3–6 lpp.

824 LVVA, 2125 f., 5 ap., 105 l., 73 lp.

825 НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 110, л. 20.

а нярэдка і варожа ставіліся да беларускага руху і з'яўляліся патэнцыйным рухавіком ператварэння беларускіх школ у рускія[826]. Гэтыя людзі камфортней адчувалі сябе ў рускім асяроддзі, таму шукалі кантактаў з рускімі дзеячамі, пад уплывам якіх ініцыявалі змену нацыянальнай юрысдыкцыі школ. Пасіўнае ж у грамадскім і нацыянальным сэнсе насельніцтва было маўклівым назіральнікам. Тут варта пагадзіцца з аргументамі беларускага боку, які лічыў, што прычынай пратэстаў быў страх настаўнікаў-рускіх за працоўныя месцы. Не здаўшы іспыту па беларусазнаўстве і не ўвёўшы ў сваіх школах беларускай мовы, яны былі б вымушаны іх пакінуць[827].

На моўныя прэферэнцыі беларускамоўных сялян уплываў і высокі сацыяльны статус рускай мовы ў краіне. Яны рупіліся, каб іх дзеці ў той ці іншай ступені авалодалі рускай мовай, якая магла ім забяспечыць лепшую працу і дабрабыт. З гэтага часта вынікала адмоўнае стаўленне да беларускіх школ. Асабліва такія настроі былі ўласцівыя не толькі праваслаўнай частцы беларускамоўнага латгальскага сялянства, але назіраліся таксама сярод каталікоў і стараверaў. Напрыклад, у 1923 г. К. Езавітаў прызнаваў, што ў Малінаўскай воласці шмат стараверaў, якія лічаць сябе беларусамі і размаўляюць па-беларуску, але выступаюць супраць таго, каб іх дзеці вучылі ў школе беларускую мову[828]. Сітуацыю добра разумелі дзеячы рускай меншасці, якія пераконвалі сялян патрабаваць ператварэння школ з беларускіх у рускія. У снежні 1923 г. кіраўнік Борхаўскай школы (Янавольская воласць) Паўліс Шварцбах інфармаваў К. Езавітава, што мясцовыя праваслаўныя лічаць сябе рускімі і варожа ставяцца да выкладання беларускай мовы, патрабуючы пераводу школы ў Рускі школьны аддзел[829].

Нізкую нацыянальную самасвядомасць насельніцтва выкарыстоўвалі таксама беларускія дзеячы. Напрыклад, у 1922 г. непісьменная Ксенія Рэпнікава падпісала заяву пра адкрыццё ў яе мясцовасці беларускай школы. Аднак пазней аказалася, што гэта была заява пра ператварэнне мясцовай рускай школы ў беларускую, пра што заяўніца не ведала[830]. У адказ на сходы, якія патрабавалі перадаць школы ў Рускі школьны аддзел, беларускія дзеячы ініцыявалі ўласныя сходы бацькоў, якія патрабавалі захаваць беларускі характар школ. У верасні 1922 г. К. Езавітаў інфармаваў БША, што атрымаў першую партыю пратэстаў ад бацькоў 114 вучняў (жыхароў вёсак Стрэмкі, Бярозкі,

---

826 *Расейскі паход на беларускія школы*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1929, № 9(1), с. 4.

827 LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 37–38 lpp.

828 LVVA, 2125 f., 5 apr., 40 l., 135 lp.

829 LVVA, 2125 f., 5 apr., 114 l., 3 lp.

830 К. Казачёнок, *"Белорусский процесс" в Латвии: обвинение, оправдание, наказание*, "Латыши и белорусы: вместе сквозь века. Сборник научных статей", ред. М.Г.Королёв, Минск 2012, с. 37.

Аляксандрова, Кісялеўцы, Прыдруйск), якія наведвалі 1-ю Прыдруйскую школу. Падпісанты жадалі, каб школа заставалася беларускай[831].

Беларускі школьны аддзел быў вымушаны пагадзіцца на рускамоўнае выкладанне ў падначаленых яму школах. БША разглядаў гэты крок як вымушаную і часовую з'яву, якая супакоіць насельніцтва. Рускамоўнае навучанне планавалі паступова абмяжоўваць, аж пакуль яно не знікне з беларускіх школ. Такім чынам беларускія дзеячы ўклалі з сялянствам нешта накшталт няпісанай дамовы: прысутнасць рускай мовы ўзамен за захаванне фармальнай беларускай юрысдыкцыі. На практыцы гэта не заўсёды прыносіла чаканыя вынікі. Так, бацькі Борхаўскай школы не перасталі патрабаваць яе пераводу ў падпарадкаванне Рускага школьнага аддзела, хоць яшчэ 27 студзеня 1922 г. кіраўніцтва БША паведаміла кіраўніка школы, што мовай выкладання застаецца руская, а па-беларуску будзе вывучацца толькі беларусазнаўства, гісторыя і геаграфія Беларусі. Настаўніцай гэтых прадметаў была Алена Шварцбах, беларуска і жонка кіраўніка школы-латыша[832].

Прысутнасць у мурах беларускіх школ рускай мовы стварала небяспечны прэцэдэнт, які мог прывесці да страты гэтых школ. Гэта бянтэжыла не толькі прыхільнікаў беларушчыны, але і латвійскіх урадоўцаў, якія бачылі ў гэтым нагоду павялічыць колькасць латышскіх школ. У жніўні 1923 г. рашэннем Лудзенскай павятовай школьнай управы Нова-Слабадская і Рэйкаўская школы былі ператвораныя ў латышскія, але з захаваннем магчымасці вучням даву чыцца на рускай мове. Гэта абурыла К. Езавітава, які лічыў, што такім чынам пад латышскай шыльдай будзе адбывацца русіфікацыя беларусаў. Ён лічыў, што за перадачай гэтых школ стаяў павятовы школьны інспектар Свэнэ, які з самага пачатку адмоўна ставіўся да беларускай школьнай справы[833]. У жніўні і лістападзе 1923 г. бацькі вучняў Рэйкаўскай школы некалькі разоў патрабавалі вярнуць яе ў падпарадкаванне БША, а ў выпадку немагчымасці стварыць беларускі камплект. Настаўніца школы Марыя Казлоўская сцвярджала, што ў 1922/23 гг. школу наведвалі 62 беларусы і 2 цыганы, а ў наступным – 71 вучань, сярод якіх не было ніводнага латыша. Адначасова настаўніца інфармавала, што бацькі вучняў у пашпартах былі запісаныя "рускімі" без падзелу на вялікаросаў і беларусаў[834]. Лудзенская павятовая школьная ўправа тлумачыла рашэнне зрабіць школу латышскай тым, што пераважная большасць мясцовага жыхарства размаўляе ў хаце па-латгальску. На думку чыноўнікаў тычылася гэта нават праваслаўных, якія, блытаючы веравызнанне з нацыянальнасцю, называлі сябе рускімі. Інспектар управы наведаў

[831] LVVA, 2125 f., 5 apr., 95 l., 26 lp.
[832] LVVA, 2125 f., 5 apr., 114 l., 3 lp.
[833] LVVA, 2125 f., 5 ap., 40 l., 90–92 lpp.
[834] LVVA, 2125 f., 5 ap., 40 l., 109, 114 lpp.

шэраг вёсак Янавольскай воласці і "ў неафіцыйным парадку" размаўляў на латгальскай гаворцы з жыхарамі. Паводле яго назіранняў, толькі нешматлікія суразмоўцы не разумелі па-латышску. Управа лічыла, што прыйшоў час спыніць русіфікацыю латгальцаў праз беларускія школы[835].

7 снежня 1923 г. Беларускі школьны аддзел аспрэчыў рашэнне Лудзенскай павятовай школьнай управы. У дакуменце падкрэслівалася, што сцвярджэнні пра русіфікацыю латгальцаў у беларускіх школах пазбаўленыя рацыянальных падстаў, бо беларускія школы існуюць дзеля нацыянальна-культурнага выхавання беларускай меншасці і нічога супольнага не маюць з русіфікацыяй. Кіраўнік БША называў прысутнасць рускай мовы ў беларускіх школах вымушанай часовай з'явай. Акрамя таго, беларускі бок пратэставаў супраць высноў управы пра латышскі нацыянальны характар Янавольскай воласці. Ён спасылаўся на звесткі Латвійскай статыстычнай управы, паводле якой беларусы ў воласці складалі аж 66%. Кіраўніцтва БША адзначала, што шматкультурнае насельніцтва Латгаліі валодае адразу некалькімі мовамі, таму з інспектарам павятовай школьнай управы людзі размаўлялі на мове, якой ён да іх звяртаўся. А пра беларускасць жыхароў воласці, сцвярджаў беларускі бок, сведчаць іх прозвішчы і назвы вёсак[836].

Беларускія школьныя ўлады намагаліся спыніць працэс страты школ таксама шляхам пісьмовых пратэстаў. 30 лістапада 1922 г. у петыцыі на імя міністра асветы кіраўніцтва БША катэгарычна не пагаджалася з перадачай некалькіх школ у распараджэнне Рускага школьнага аддзела. Беларусы аспрэчвалі рускія прэтэнзіі на беларускія школы на Даўгаўпілшчыне і Лудзеншчыне. У дакуменце падкрэслівалася, што паўднёвая частка Лудзенскага павета ніколі не належала да рускага этнаграфічнага абшару, а тамтэйшыя рускія – перасяленцы з цэнтральнай Расіі. Аўтары лічылі, што за асноўны крытэрый вызначэння нацыянальнасці належыць браць мову, якой гаворыць насельніцтва. Далей у дакуменце чытаем: "*Пад шматгадовым рускім уплывам, які выклікаў пагардлівае стаўленне да ўсяго беларускага, у тым ліку і да мовы як 'мужыцкай', беларусы пачалі саромецца сваёй роднай мовы. Але, нягледзячы на гэта, беларуская мова яшчэ жыве сярод насельніцтва і ў хатнім ужытку вясковых жыхароў. Гэта ясна і з таго, што, нягледзячы на шматвекавыя*

---

[835] LVVA, 2125 f., 5 ap., 40 l., 107 lp.

[836] У дакуменце чытаем: "*Самыя назвы вёскаў, а таксама прозвішчы насельніцтва ў іх гавораць самі за сябе: Рэйкі, Астэнкі, Выдры, Лавушкі, а ў іх жывуць: Акашавы (беларускае 'аканне'), Кухарэнкі, Зелья (зелле-лекі), Петуховы, Аляксандравы, Халодныя, Лямешавы (лямеш – частка плуга), Мідарэнкі, Труханавы (труха – дробнае сена), Расіменкі, Галубенкі, Сабачавы, Завадскія, Котавы, Якаўлевы, Бярэжкіны, Кудраўцовы, Тарасавы, Барановічы і інш. Беларускае ўпраўленне зусім не прэтэндуе на тое, каб беларусізаваць латгальскае насельніцтва, але яно хацела б, каб беларускае жыхарства Латгаліі захавала сваю нацыянальнасць*". LVVA, 2125 f., 5 ap., 40 l., 113 lp.

неспрыяльныя абставіны для развіцця беларускага народа, ужо праз год культурнай работы беларускага ўпраўлення ў многіх школах Дзвінскага павета ўдалося ўвесці выкладанне па-беларуску; дакладна гэтак жа выкладанне вядзецца выключна на гэтай мове ў Дзвінскіх дзяржаўных беларускіх гімназіях і на настаўніцкіх курсах. Ад пачатку гэтага навучальнага года і ва ўсіх школах Люцынскага павета ўведзены прадмет беларусазнаўства. З'яўленне асобных хадайніцтваў пра зваротнае перайменаванне беларускіх школ у рускія ці польскія тлумачыцца простай прычынай: ні для палякаў, ні для вялікаросаў непажадана культурнае адраджэнне беларусаў, бо яно скарачае сферу ўплыву і тых, і другіх. Апроч таго, і ў свядомасці часткі настаўніцтва і насельніцтва яшчэ трымаецца стары погляд пра перавагу польскай і вялікарускай культуры. Подобныя хадайніцтвы (...) прыходзяць менавіта з тых месцаў, дзе настаўнікі вялікаросы ці наогул нядобразычліва настроеныя да культурна-асветнай беларускай справы. У распараджэнні аддзела маецца дазнанне з нагоды аднаго такога хадайніцтва пра перайменаванне Веркулоўскай беларускай школы ў рускую. Там загадчыца школай наўпрост заявіла ў прысутнасці сведкаў: 'Я все сделаю, чтобы только школа оставалась русской'"[837].

20 снежня 1922 г. Беларускі школьны аддзел звярнуўся ў школьны дэпартамент Міністэрства асветы са службовай запіскай, у якой чытаем: "*У Люцынскім павеце некаторыя прадстаўнікі велікарускай супольнасці, маючы падтрымку ў асобе аднаго з дэпутатаў Сойма ад рускага насельніцтва, пачалі на месцах і ў друку кампанію супраць беларускай школы. У выніку маюцца пастановы некаторых школьных рад пра перадачу беларускіх школ у Рускі аддзел*"[838]. 23 снежня 1922 г. БША выслаў пратэст у Лудзенскую павятовую школьную ўправу з просьбай ануляваць рашэнне пра пераход вышэйзгаданых школ у Рускі школьны аддзел. У звароце адзначалася, што нацыянальная свядомасць латгальскіх беларусаў яшчэ слабая, паколькі нацыянальная праца сярод іх вядзецца ўсяго некалькі год, тым часам, як русіфікацыя і паланізацыя адбываліся цягам стагоддзяў. На думку кіраўніцтва БША, гэтым належыць тлумачыць факт, што маласвядомае беларускае сялянства трапляе пад уплывы рускіх і польскіх дзеячоў. На думку аўтараў дакумента, адказнасць за непаразуменні нясуць рускія настаўнікі, якія варожа ставяцца да беларускага руху і пераконваюць бацькаў сваіх вучняў, што навучанне па-беларуску непатрэбнае, а беларушчына з'яўляецца прыкметай "хамства" і "цемнаты". Акрамя таго, беларускі бок лічыў, што страце школ спрыяла злая воля мясцовых чыноўнікаў у павятовых (асабліва лудзенскай) школьных управах, якія байкатавалі прызначэнні ў беларускія школы выпускнікоў беларускіх настаўніцкіх курсаў, накіроўваючы туды рускіх настаўнікаў, а тыя пасля пат-

[837] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 43, л. 7–8.

[838] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 45, л. 1

рабавалі пераводу школ у Рускі школьны аддзел[839]. На прапанову К. Езавітава кіраўнік БША прасіў затрымаць перадачу згаданых школ Рускаму школьнаму аддзелу, а замест гэтага аддаць іх на 1–2 гады ў Агульны школьны дэпартамент – да моманту, пакуль БША стане на ногі і здолее бараніць свае школы ад замахаў значна мацнейшага Рускага школьнага аддзела. Беларускі актыў разлічваў, што так удасца прадухіліць перадачу школ у распараджэнне Рускага школьнага аддзела[840]. Час, аднак, паказаў, што беларусы назаўсёды страцілі гэтыя школы.

Рускія актывісты не задаволіліся трыма згаданымі школамі. Пазней яны не перасталі спрабаваць павялічваць колькасць сваіх школ шляхам ліквідацыі беларускіх. 2 лістапада 1923 г. удзельнікі бацькоўскага сходу Зілупскай беларускай школы выказаліся за тое, каб агульныя прадметы ў ёй выкладаліся на рускай мове, паколькі яна "*для родителей и их детей является языком вполне понятным для усвоения знаний и практически необходим*"[841]. На думку ўдзельнікаў сходу, вучні-беларусы ў школе складалі толькі 30%. Сход, спасылаючыся на волю бацькоў, пастанавіў прасіць улады пра перадачу школы ў распараджэнне Рускага школьнага аддзела[842]. Каб высветліць сітуацыю, школу наведаў К. Езавітаў, які ў рапарце кіраўніцтву БША пісаў наступнае: "*1-га і 2-га снежня я, згодна прадпісання Вашага ад 24 лістапада за № 3446, выязджаў у Розенаўскую (Зілупскую) Беларускую Пачатковую школу для ўдзелу ў сходзе Школьнае Рады. Становішча гэткае: бацькі, падбухтораныя, з аднаго боку ксяндзоўска-польскай, а з другога боку расейскай агітацыяй, зажадалі перайменаваць сваю школу з беларускай у расейскую, аб чым і гутарылі на агульным сваім сходзе. Школьная Рада, абраная на гэтым сходзе, пад уплывам доктара расейца, Рыхтара (па веравызнанні – стараабрадзец, а па нацыянальнасці немец, бацька яго быў нават, здаецца, лютэранін, бо сын 'Фернандавіч'), пастанавіла школу перайменаваць аб чым і вынесла рэзалюцыю, копія якой пры гэтым Вам дасылаецца. Пасля маіх тлумачэнняў рэзалюцыю сваю Школьная Рада ўзяла назад і вынесла другую рэзалюцыю, копію якой пры гэтым таксама Вам пасылаю. Найбольшая бяда, гэта тая, што школа дужа рэдка бачыць прадстаўнікоў беларускага руху, і сяляне-бацькі дык ніколі яшчэ не чулі ніводнага слова ў сваёй роднай мове, ды і нават у іншых мовах аб беларусах і беларускім руху, але затое шмат наслухаліся аб ім ад ворагаў беларускага адраджэння. Патрэбна энергічная інспектура беларускіх школ, гутаркі з бацькамі і дзеткамі. Пасля сходу Школьнай Рады я склікаў вучняў і некаторых бацькоў і дэманстраваў*

[839] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 110, л. 3–5.
[840] LVVA, 2125 f., 5 apr., 38 l., 694 lp.
[841] LVVA, 2125 f., 5 ap., 232 l., 86 lp.
[842] LVVA, 2125 f., 5 ap., 232 l., 89 lp.

ім кіно Гімназіі, якім усе былі дужа задаволены"[843]. Нягледзячы на захады беларускага актыву, у 1923/24 гг. Зілупская беларуская 6-гадовая школа была ператвораная ў дзяржаўную школу для навучання дзяцей розных нацыянальнасцей. У кастрычніку 1924 г. БША беспаспяхова патрабаваў ад мясцовых і цэнтральных устаноў адукацыі прызначыць туды на працу 1–2 настаўнікаў-беларусаў[844].

У змаганні за школы рускі бок па-ранейшаму карыстаўся выпрабаванай зброяй – бацькоўскімі петыцыямі. 25 лістапада 1923 г. бацькоўскі сход Шушкаўскай беларускай школы ўхваліў пастанову пра адмову ад выкладання беларускай мовы і замену яе на рускую. Згодна з гэтым рашэннем, нават прадметы па гісторыі і геаграфіі Беларусі павінны былі выкладацца па-руску. Кіраўнік школы, латыш Паўліс Шварцбах, патлумачыў крок бацькоў наступным чынам: "*Гэтую пастанову бацькі вучняў матывавалі тым, што беларуская мова ім зусім лішняя, бо з ёй далей мяжы сваёй вёскі не пойдзеш. У той час беларускай мовы дадзена ў тыдзень шмат гадзін, якія можна было б скарыстаць галоўным чынам на вучэнне дзяржаўнае мовы і гэткіх прадметаў, якія неабходны ў жыцці (...) Дадаю, што стараннe пераверыць бацькоў аб неабходнасці беларускае мовы ім, як беларусам, не дасягнула жаданых вынікаў. У гэтым выпадку яны моцна становяцца проці, не трэба беларускай мовы, досыць, што карыстаюцца ёй у хаце*"[845]. 9 снежня 1923 г. бацькоўскі сход школы аднагалосна выказаўся за тое, каб школа была перайменаваная ў рускую, а "*белорусский язык просим из школы изъять совершенно, каковой считаем ненужным, а посему просим изъять школу из Белорусского отдела, а присоединить таковую к Русскому отделу*"[846].

19 снежня 1924 г. бацькоўскі сход Борхаўскай 4-гадовай беларускай школы таксама запатрабаваў, каб установа была ператвораная ў рускую. У якасці аргумента прыводзілася адмоўнае стаўленне вучняў да ўрокаў беларускай мовы. У пратаколе сходу сцвярджалася, што яна "чужая" вучням. Аднак Лудзенская павятовая школьная ўправа паставіла пад сумнеў меркаванне ўдзельнікаў сходу і запатрабавала дакладней вывучыць сітуацыю[847]. У выніку школа пратрымалася ў падпарадкаванні Беларускага школьнага аддзела яшчэ тры гады.

Спробы "вяртання" школ у Рускі школьны аддзел пачасціліся, калі яго ачоліў Фёдар Сяркоў. Ён павёў актыўную палітыку змагання з беларусамі за школы. 18 верасня 1924 г. кіраўнік Рускага школьнага аддзела ў размове

---

[843] LVVA, 2125 f., 5 ap., 232 l., 88 lp.
[844] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 44, л. 21.
[845] LVVA, 2125 f., 5 apr., 40 l., 131 lp.
[846] LVVA, 2125 f., 5 apr., 114 l., 28 lp.
[847] LVVA, 1632 f., 2 apr., 493 l., 93 lp.

з карэспандэнтам газеты "Сегодня" выказаў прэтэнзію, што шмат рускіх дзяцей знаходзіцца ў беларускіх школах[848]. Рускі школьны аддзел стараўся пра атрыманне беларускай Рунданскай школы, аднак Лудзенская павятовая школьная ўправа не знайшла для гэтага падстаў. Тады Рускі школьны аддзел прапанаваў кіраўніку школы Пятру Клявіню і яго жонцы дапамогу за згоду перайсці ў яго падпарадкаванне. У адказ БША звярнуўся да міністра асветы з просьбай перавесці гэтых настаўнікаў у Рускі школьны аддзел, але школу пакінуць у беларускай юрысдыкцыі[849]. Дзякуючы намаганням беларускім дзеячаў, Рунданская школа яшчэ некалькі год знаходзілася ў падпарадкаванні БША.

Беларуска-рускія спрэчкі за школы назіраліся не толькі на Даўгаўпілшчыне і Лудзеншчыне, але таксама на Рэжыччыне і Ілукшчыне. У гэтых паветах існавалі рускія школы, якія беларускія дзеячы жадалі перавесці ў падпарадкаванне Беларускага школьнага аддзела, аргументуючы тым, што значную частку вучняў складалі беларусы. Захады беларускіх школьных інспектараў не знайшлі разумення ў мясцовага настаўніцтва і павятовых школьных управаў. К. Езавітаў канстатаваў, што школьную працу належыць разгортваць не "зверху" праз чыноўнікаў, а "знізу" праз уцягванне насельніцтва ў беларускую культурна-асветную працу[850].

Дзейнасць рускага актыву па пераводзе беларускіх школ у сваё падпарадкаванне ўзмацнілася ў 1924 і 1925 гг., калі беларускія дзеячы апынуліся пад следствам. Рускі бок адчуваў, што аслабленне беларусаў дае магчымасць фарсіраваць пераход чарговых беларускіх школ у юрысдыкцыю Рускага школьнага аддзела. Выданне *Русский календарь на 1925 год*, якое выйшла ў рыжскай друкарні Р. Мінкіна, змяшчала артыкул *Белорусский вопрос*, аўтар якога крытычна выказваўся пра беларускі рух і беларускія школы ў Латвіі: "*Да самых цяжкіх і нават крыўдных пытанняў для рускіх адносіцца так званае беларускае пытанне, якое нанесла рускай культуры і вясковаму насельніцтву шкоду, загладзіць якую нельга будзе і за многія гады (...) Няма ніякіх апраўданняў для падобнай згубнай памылкі, якая пацягнула за сабой адабранне ў рускіх больш як 40 школ і пазбаўленне асігнаванняў па некалькі мільёнаў рублёў на год на народную адукацыю. Беларуская палітыка стала нейкай 'заклятай' для рускага народа з таго дня, калі па чыімсьці распараджэнні шмат школ Люцынскага і Дзвінскага паветаў раптам былі перайменаваныя з рускіх у беларускія. Калі сталі ўводзіць недарэчны і невядомы для рускіх говар, абернуты па ўказцы з Берліна ў 'мову', то тады ж сталі прыходзіць масавыя пратэсты бацькоў і нават цэлых валасцей супраць гвалтоўнага*

[848] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 167, л. 9.

[849] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 44, л. 32.

[850] К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, Рыга 1927 [перадрук: Нью-Ёрк – Менск 2013], с. 88–89.

абеларушвання"[851]. Аўтар заклікаў узмацніць змаганне супраць беларусаў, каб "вярнуць" школы ў Рускі школьны аддзел. Пры гэтым ён сцвярджаў, што змяніць сітуацыю могуць вынікі перапісу насельніцтва, падчас якога запісанае раней беларусамі насельніцтва запішацца рускімі[852].

У разгар беларускага працэсу 23 верасня 1924 г. Лудзенская школьная ўправа дазволіла стварыць у вёсцы Курылы 4-гадовую рускую школу. У адказ Беларускі школьны аддзел у лісце міністру асветы назваў немэтазгодным адкрыццё рускай школы ў мясцовасці з амаль цалкам беларускім насельніцтвам. На думку БША гэта магло дэзарганізаваць навучальны працэс у навакольных беларускіх школах. Кіраўнік БША лічыў, што новая школа павінна быць беларускай, таму прапаноўваў адклікаць з яе рускага настаўніка і прызначыць беларуса. Ён лічыў, што часова школа можа застацца ў распараджэнні Агульнага школьнага дэпартамента, пасля чаго мае апынуцца ў падпарадкаванні БША[853]. У іншым дакуменце С. Сахараў адзначаў, што ў Лудзы і Лудзенскім павеце пачалося завабліванне вучняў беларускай гімназіі і школ у мясцовыя рускія[854]. Так, 1 верасня 1924 г. Лудзенская школьная ўправа загадала адчыніць у Пітэрскай беларускай школе клас з рускай мовай навучання. БША дамагаўся ад міністра асветы закрыць гэты клас[855]. У сакавіку і снежні 1924 г. з ініцыятывы мясцовых рускіх актывістаў бацькоўскі сход Борхаўскай беларускай школы пастанавіў перадаць яе ў падпарадкаванне Рускага школьнага аддзела[856]. Але на абарону беларускай школы стаў школьны інспектар, які лічыў дзеянні Рускага школьнага аддзела недапушчальнымі. Чыноўнік звяртаў увагу на тое, што РША вёў несумленную агітацыю сярод бацькоў Борхаўскай школы, а гэта супярэчыць заканадаўству аб правах нацменаў на атрыманне асветы на роднай мове[857]. У 1925 г. супрацоўнік Рускага школьнага аддзела Дзервінка зноў зрабіў спробу ператварыць гэтую школу ў рускую. Аднак у выніку ўмяшання латвійскіх школьных улад было вырашана пакінуць яе беларусам, а Дзервінка быў звольнены з Міністэрства асветы[858].

Беларуска-руская "школьная вайна" ў Латгаліі цягнулася да самага канца існавання адукацыйнай аўтаноміі нацыянальных меншасцей у Латвіі.

---

[851] LVVA, 2125 f., 5 apr., 75 l., 46 lp.

[852] LVVA, 2125 f., 5 apr., 75 l., 46–49 lpp.

[853] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 44, л. 28.

[854] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 44, л. 18.

[855] НАРБ, ф. 458., воп. 1., спр. 44, л. 20.

[856] LVVA, 1632 f., 2 apr., 492 l., 93 lp.

[857] LVVA, 1632 f., 2 apr., 493 l., 88 lp.

[858] К. Казачёнок, *"Белорусский процесс" в Латвии: обвинение, оправдание, наказание*, "Латыши и белорусы: вместе сквозь века. Сборник научных статей", ред. М.Г.Королёв, Минск 2012, с. 40.

Дакументы з архіву Беларускага школьнага аддзела, дазваляюць падрабязна прасачыць далейшы ход канфлікту. У 1928 г. інспектар беларускіх школ інфармаваў пра жаданне некаторых бацькоў вучняў Нямецгорскай школы (Лудзенскі павет) перавесці яе ў Рускі школьны аддзел. Аднак гэтую ініцыятыву паспяхова спыніў інспектар Я. Кастылюк[859].

26 красавіка 1929 г. настаўнік школы Васіль Руднікаў інфармаваў беларускага інспектара пра тое, што "*істэрскія рускаіконцы хочуць Пітэрскую беларускую школу абадраць і перарабіць у расейскую. Імі ўжо зроблены адпаведныя крокі дзеля гэтага адабрання школы*"[860]. Рускія дзеячы сабралі бацькоўскія заявы і перадалі ў Лудзенскую павятовую школьную ўправу. На пасяджэнні апошняй 3 траўня 1929 г. была разгледжана справа магчымай перадачы ў Рускі школьны аддзел трох беларускіх школ: Пітэрскай, Руднінскай і Нямецгорскай. У выніку дыскусіі і галасавання Пітэрскую школу беларусам удалося абараніць, але дзве іншыя трапілі ў падпарадкаванне Агульнага школьнага дэпартамента. Інспектар Я. Кастылюк, які ўдзельнічаў у пасяджэнні, адзначаў, што сябры ўправы не выслухалі ўсіх беларускіх аргументаў, а канкрэтна не разгледзелі заяву бацькоў 20 вучняў Руднінскай школы, якія прасілі пакінуць яе ў БША. Ён лічыў, што пытанне пра ператварэнне школы ў рускую ініцыявала жменька людзей, а менавіта: школьны стораж Аляксандр Руднік, былая настаўніца Марыя Захарава і прадстаўнік рускага настаўніцтва Сойкін. Паводле Я. Кастылюка, яны склікалі бацькоўскі сход, запрасіўшы туды толькі тых, хто лічыў сябе рускім і жадаў змены нацыянальнай юрысдыкцыі школы[861]. 8 сакавіка 1929 г. інспектар Я. Кастылюк звярнуўся ў БША з просьбай звольніць з працы А. Рудніка, які "вядзе змаганне за пераход школы ў расейскі аддзел"[862].

Аднак рускі актыў не адмовіўся ад спроб перавесці Пітэрскую школу ў падпарадкаванне Рускага школьнага аддзела. Пра настроі беларускага і рускага бакоў сведчыць рапарт інспектара Я. Кастылюка ад 7 лістапада 1929 г.: "*24-га кастрычніка быў прысутным у камісіі па апросу бацькоў раёна Піцерскае школы Люцынскага павета дзеля высвятлення іх нацыянальнасці. Апрос рабіў сябра школьнае ўправы гр. Спрындзан; пры апросе быў прысутным інспектар расейскіх школаў гр. Фармакоў. Камісія апрасіла 40 грамадзян, зазначыўшых сябе расейцамі. На сход з'явілася каля 60 грамадзян, сярод якіх старшыня Істрынскае валасное рады гр. Нікулін павёў агітацыю ў будынку за пераход Піцерскае беларускае школы ў расейскі аддзел, абзываў беларусаў камуністамі і зазначаў, што беларусаў тутака няма, а ёсць толькі адны*

[859] LVVA, 2125 f., 5 apr., 84 l., 36 lp.
[860] LVVA, 2125 f., 5 ap., 59 l., 1 lp.
[861] LVVA, 2125 f., 5 ap., 387 l., 82 lp.
[862] LVVA, 2125 f., 5 ap., 387 l., 65 lp.

расейцы, а таму беларусаў патрэбна гнаць адсюль качаргой. Пад выкрыкі і пагрозы гр. Нікуліна прыйшлося камісіі апрашываць бацькоў. Пад канец апросаў з'явіўся на сход бацюшка Вазнясенскі, які таксама павёў агітацыю за пераход школы ў расейскі аддзел, нападаючы на беларусаў і абзываючы іх камуністамі (...) Пры такой агітацыі з боку кіруючых асоб беларусам аставалася толькі адно – заявіць у камісію пратэст супраць такой агітацыі і пагроз"[863]. Вынікам непаразуменняў стаў выхад у тым жа годзе школы з падпарадкавання Беларускага школьнага аддзела[864].

Праявы беларуска-рускага школьнага канфлікту назіраліся нават у Даўгаўпілскай беларускай гімназіі. 31 жніўня 1929 г. школьная рада асудзіла дзеянні настаўніка-латыша Максімільяна Кільяна, які ў вучнёўскім інтэрнаце агітаваў іншых педагогаў ісці працаваць у рускую вячэрнюю школу для дарослых[865]. Беларускі бок з недаверам ставіўся да настаўнікаў з прарускімі настроямі. Верагодна, гэта паўплывала на рашэнне Рады БША ад 19 кастрычніка 1929 г. адмовіць у працы ў беларускай школе настаўніцы Вользе Аляксеевай, рускай паводле нацыянальнасці[866].

Атрыманне Пітэрскай школы заахвоціла Рускі школьны аддзел да змагання за іншыя беларускія адукацыйныя ўстановы на Лудзеншчыне. 1 снежня 1929 г. бацькоўскі сход Цуцуркаўскай беларускай школы прыняў рэзалюцыю пра пераход іх школы ў Рускі школьны аддзел. Сваю рашэнне бацькі матывавалі традыцыйнымі прычынамі: "*У нашай школе проціў нашай волі вядзецца абучэнне нашых дзяцей беларускай мове чужой нам, бо мы расейцы і беларуская мова зусім не знаёма і не лічым патрэбным яе знаць і вучыць. Аб чым мы не раз заяўлялі і прасілі нашу школу перавесці ў расейскі аддзел, но ўсе нашы просьбы аставалісь без рэзультата. Асновываясь на абшчым законе аб школах, а іменна, што абучэнне ў школах далжно быць на матчынай мове, а нам матчына мова расейская, а таму аднагалосна рашылі: нямедленна прасіць Люцынскую павятовую школьную раду без прамедленія нашу Цуцуркаўскую школу перадаць у расейскі аддзел*"[867]. 4 красавіка 1930 г. камісія Лудзенскай павятовай школьнай управы, пасля азнаямлення з сітуацыяй на месцы, зрабіла выснову, што 2/3 бацькоў выказваліся за пераходам школы ў Рускі школьны аддзел, а 1/3 жадала пакінуць яе ў падпарадкаванні БША[868].

Беларускія дзеячы прызнавалі, што вінаваціць у страце школ належыць перадусім сябе: кволасць беларускага руху і маласвядомасць сялянства была

[863] LVVA, 2125 f., 5 ap., 47 l., 18 lp.
[864] LVVA, 2125 f., 5 ap., 333 l., 60–64 lpp.
[865] LVVA, 2067 f., 1 ap., 377 l., 11 lp.
[866] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 10 lp.
[867] LVVA, 2125 f., 5 ap., 121 l., 58 lp.
[868] LVVA, 2125 f., 5 apr., 49 l., 88 lp.

галоўнымі саюзнікамі рускай школьнай справы[869]. Беларускі актыў намагаўся выпрацаваць практычныя механізмы, каб супрацьдзейнічаць рускаму наступу на школы. Пытанне было абмеркавана 25 сакавіка 1929 г. на пасяджэнні Рады БША. Падсумоўваючы вынікі працы інспектар Я. Кастылюк канстатаваў, што Лудзеншчына знаходзіцца пад рускім уплывам. Ён адзначаў, што развіццю беларускай школьнай справы не спрыяе мясцовае самакіраванне, дзе засядае шмат непрыхільных беларусам прадстаўнікоў рускай меншасці. Адначасова беларускі дзеяч заўважыў, што мясцовае беларускае сялянства нацыянальна маласвядомае, таму лёгка паддаецца антыбеларускай прапагандзе: "*Бацькі вучняў зусім не закранутыя беларускім нацыянальным духам, не маючы нацыянальнай сведамасці, лёгка паддаюцца ўсялякім уплывам, шкодным для беларускай школы. Вучыцельства ў большасці спачувае расейскім уплывам і жадала бы, каб гэтыя школы належалі да Расейскага аддзела. Так напр.[ыклад] вучыцелька Захарава, каторая не была праведзена, наўмыслна не прымала вучняў-беларусаў, і таму ў школе было толькі 26 вучняў, а калі яе замянілі, стала 36, – так сама і вучыцелька Эйгліш больш хварэе чым вучыць, а яе муж вядзе агітацыю супраць беларускае школы. Як працівавес гэтаму пры некаторых школах арганізуюцца 'Гурткі Беларускае Моладзі', якія (...) зробяць пэўны ўплыў на жыхарства, карысны для беларускае справы*"[870]. Акрамя таго, Я. Кастылюк лічыў, што належыць узмацніць сувязь настаўніцтва з грамадскасцю і праводзіць нацыянальна-ўсведамляючую працу пра шкоднасць пераходу школ да рускіх. У прыватнасці, ён заклікаў ладзіць у вёсках курсы па кааперацыі і грамадазнаўстве[871].

5 студзеня 1930 г. адбылася нарада беларускага настаўніцтва Лудзеншчыны. Удзельнікі абмяркоўвалі, як супрацьдзейнічаць агітацыі па ператварэнні беларускіх школ у рускія, якая вялася "маскалямі і беларусамі-рэнегатамі" ў Істэрскай воласці[872]. Прысутныя прынялі рэзалюцыю наступнага зместу: "*Беларускае вучыцельства Люцынскага пав.[ета] канстатуючы, што шэраг адказных і безадказных асоб велікарускай нацыянальнасці ўсялякімі недапушчальнымі спосабамі падбухторваюць жыхарства Істрэнскай воласці проці беларускай меншасці, прызнае, што дзейнасць гэтых асоб не толькі нарушае ціхае і мірнае школьнае жыццё, але, разам з тым, з'яўляецца надта шкодным для мірнага сужыцця нацыянальнасцяў жывучых у Латвійскай дзяржаве*"[873]. 3 траўня 1930 г., падчас пасяджэння Рады БША,

---

[869] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 35, л. 5.

[870] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 95 lp.

[871] LVVA, 2125 f., 5 ap., 4 l., 95 lp.

[872] *Нарада беларускіх вучыцялеў Люцынскага павету*, "Наша доля" 1930, № 1 ад 26 студзеня, с. 4.

[873] LVVA, 2125 f., 5 ap., 47 l., 23 lp.

кіраўнік таварыства "Беларуская хата" М. Дзямідаў звярнуў увагу на неабходнасць узмацніць нацыянальна-культурную працу сярод сялянства Істэрскай воласці ў сувязі з "паходам велікарускіх колаў на беларускія школы"[874]. Трывогу дзеяча выклікаў факт, што ў 1929/30 гг. у шэрагу школ Істэрскай воласці адбыліся бацькоўскія сходы, удзельнікі якіх патрабавалі выхаду з падпарадкавання Беларускага школьнага аддзела. У той навучальны год беларусы страцілі на карысць рускіх яшчэ дзве школ на Лудзеншчыне – Ляўдарскую і Ляўзінскую[875].

5 чэрвеня 1930 г. Рада БША абскардзіла рашэнне Лудзенскай павятовай школьнай управы пра ператварэнне вышэйзгаданых школ у рускія. Беларусы аргументавалі, што ў склад камісій па вывучэнні нацыянальнасці вучняў тых школ не былі ўключаныя прадстаўнікі Міністэрства асветы і беларускі школьны інспектар. Беларускі бок падкрэсліваў, што страчаныя школы бесперашкодна працавалі на Істэршчыне на працягу многіх год, а мясцовыя жыхары дэкларавалі беларускую нацыянальнасць. Беларусы лічылі пастановы бацькоўскіх сходаў неправамоцнымі, бо на іх была запрошана толькі палова бацькоў. Рада БША вырашыла скіраваць да намесніка міністра асветы дэлегацыю з просьбай пакінуць школы беларусам, а таксама звярнуцца да міністра асветы з просьбай пакінуць беларусам Шылаўскую школу (Пасіенская воласць), над якой таксама навісла пагроза пераводу ў Рускі школьны аддзел[876].

Паводле рускіх актывістаў, у 1922–1930 гг. Беларускі школьны аддзел страціў у Лудзенскім павеце 26 пачатковых школ, з якіх 15 было перададзена Рускаму школьнаму аддзелу, а 11 – Агульнаму школьнаму дэпартаменту. Руская газета "Родная школа", якая выходзіла ў Рэжыкнэ, з гонарам інфармавала, што "вяртанне гэтых школ у роднае ўлонне" было б немагчымае без мясцовых рускіх актывістаў: сябра павятовай управы Г. Мацюшэнкі, валаснога супрацоўніка М. Варажуна і інш.[877] Гэта сведчыць пра тое, што істотную ролю ў працэсе ператварэння школ з беларускіх у рускія адыграла адсутнасць у беларусаў моцнага лобі ў органах мясцовага самакіравання.

Адначасова з пераходам школ у падпарадкаванне Рускага школьнага аддзела змяншалася колькасць жыхароў, якія дэкларавалі беларускую нацыянальнасць. У перыяд з 1925 па 1930 гг. на Лудзеншчыне лічба беларусаў упала з 9 392 да 4 786 чал. У той самы час колькасць рускіх вырасла з 20 207 да 25 142. Такім чынам, беларусаў паменела на 4 606, а рускіх паболела на 4 935. Няма падстаў сцвярджаць, што ўсе гэтыя людзі аўтаматычна "перапісаліся", але

---

[874] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 15 lp.

[875] LVVA, 2125 f., 5 ap., 333 l., 63 lp.

[876] LVVA, 2125 f., 5 ap., 5 l., 16 lp.

[877] *Борьба за русские школы в Люцинском уезде*, "Родная школа" 1930, № 10, с. 3.

большасць –дакладна. У той самы час лічба беларусаў на Даўгаўпілшчыне паменшылася (з 17 582 да 13 544) на 4 038, а рускіх выросла (з 36 403 да 38 528) на 2 128 чал.[878]

Падсумоўваючы вынікі беларуска-рускага школьнага "спаборніцтва" ў Латвіі, належыць дадаць, што яно ўскладняла навучальны працэс. Замест канструктыўнай школьнай працы настаўнікі і кіраўніцтва БША былі вымушаны траціць шмат энергіі на барацьбу за захаванне школ у сваёй юрысдыкцыі. Асноўным полем беларуска-рускага школьнага канфлікту з'яўляўся Лудзенскі павет, дзе пражывала праваслаўнае насельніцтва. Тым часам, непаразуменні паміж беларусамі і рускімі на школьнай глебе радзей здараліся на Даўгаўпілшчыне (з выключэннем Даўгаўпілса, дзе жыла значная частка рускіх). Для беларускіх школ гэта было змаганне за выжыванне, бо поспех рускага боку мог прывесці да поўнай ліквідацыі беларускай школьнай справы. Гэта яскрава пацвярджаюць лічбы. На працягу 1922–1933 гг. беларусы страцілі 37 пачатковых школ, у тым ліку 7 – на Даўгаўпілшчыне і ажно 30 – на Лудзеншчыне. Асноўнай прычынай былі беларуска-рускія непаразуменні. Разам з тым, нельга сказаць, што рускія дзеячы дасягнулі сваёй мэты. Колькасць рускіх школ у абмежаванай ступені павялічылася за кошт страт БША. У выніку канфліктаў пераважная большасць беларускіх адукацыйных устаноў апынулася ў складзе не Рускага школьнага аддзела, а Агульнага школьнага дэпартамента (гл. раздзел III). Такім чынам, беларуска-рускімі спрэчкамі скарысталіся латышы, якія змаглі павялічыць колькасць сваіх школ нават там, дзе складалі меншасць.

Школьная справа была галоўнай, але не адзінай сферай грамадскага жыцця, дзе перакрыжоўваліся інтарэсы беларускіх і рускіх дзеячаў. Яшчэ адным полем канфлікту з'яўлялася Праваслаўная царква. Працяглы час латвійскае праваслаўе з фармальна-кананічнага пункту гледжання было часткай Маскоўскага патрыярхату. Толькі ў другой палове 1930-х гг. удалося пазбавіцца залежнасці шляхам вяртання ў юрысдыкцыю Усяленскага патрыярхату[879]. Нагадаем, рускія складалі найбольшую групу вернікаў

---

[878] *Treša tautas skaitišana Latvijā 1930. gadā*, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1930, s. 89.

[879] Натуральным для латвійскай дзяржавы было імкненне забяспечыць праваслаўнай царкоўнай арганізацыі ў межах Латвіі незалежнасць ад Масквы. У жніўні 1920 г. быў створаны Сінод Латвійскай праваслаўнай царквы (ЛПЦ), прызнаны ўрадам. 19 ліпеня 1921 г. ачольнік Рускай праваслаўнай царквы (РПЦ) патрыярх Ціхан (Белавін) надаў Латвійскай праваслаўнай царкве аўтаномію ў гаспадарчых, адміністрацыйных, школьна-асветных і цывільных справах. Кіраўніком ЛПЦ стаў архіепіскап Іаан (Померс), латыш. Восенню 1926 г. былі зацверджаныя "Правілы аб палажэнні Праваслаўнай царквы", згодна з якімі ЛПЦ атрымала юрыдычны статус. У лютым 1936 г. Канстанцінопальскі патрыярх Веніямін надаў ЛПЦ аўтаномію і такім чынам санкцыянаваў стварэнне латвійскага праваслаўя ў сваёй юрысдыкцыі. У сакавіку гэтага ж года

латвійскага праваслаўя – 61,7%, беларусы – толькі 5,4%[880]. Беларускія дзеячы намагаліся аспрэчыць традыцыйную формулу, паводле якой праваслаўнае веравызнанне атаясамлівалася з прыналежнасцю да рускай нацыянальнасці. На старонках газеты "Наша доля" беларускі аўтар палемізаваў з рускай газетай "Сегодня", якая надрукавала зацемку пра тое, што праваслаўныя "велікарусы, беларусы і ўкраінцы" гэта адзіны народ[881]. Напярэдадні перапісу насельніцтва ў 1930 г. латвійскія ўлады выдалі інструкцыю для перапісчыкаў, згодна з якой належала адрозніваць "вялікарусаў" і "беларусаў", а не запісваць усіх праваслаўных ("рускай веры") рускімі[882].

Гістарычна праваслаўе на латвійскіх землях успрымалася як праява рускай культурнай экспансіі. Праваслаўная царква ў Латгаліі традыцыйна атаясамлівалася з расійскасцю, а нацыянальна несвядомыя мясцовыя сяляне нярэдка лічылі сваю "рускую веру" сведчаннем прыналежнасці да рускай нацыянальнасці. Гэтаму спрыяла палітыка царскіх улад, якія разглядалі праваслаўе як адзін з галоўных інструментаў русіфікацыі нярускага (у тым ліку беларускага) насельніцтва Расійскай Імперыі. У латгальскіх прыходах з беларускім насельніцтвам служылі рускія святары. Нягледзячы на распад імперыі і стварэнне незалежнай латвійскай дзяржавы, многія з іх па-ранейшаму захоўвалі адданасць рускай традыцыі і культуры. З'яўленне новай нярускай нацыянальнай ідэнтычнасці на праваслаўным краявідзе Латгаліі не знайшло разумення большай часткі духавенства. Святары, якія добра памяталі царскія часы, непрыхільна ставілася да беларускага нацыянальнага руху. Выкарыстоўваючы гэта, рускія палітыкі вялі антыбеларускую дзейнасць сярод праваслаўнага жыхарства[883].

У лепшым выпадку некаторыя духоўнікі былі схільныя ўспрымаць беларусаў як частку рускага этнасу. Магчыма, гэтым тлумачыцца пасіўнае супрацоўніцтва асобных святароў з беларускай грамадскасцю ў культурна-асветных і гаспадарчых справах. Але агулам адносіны беларускіх адраджэнцаў і духавенства не былі найлепшымі. Заходнебеларускі часопіс "Наш край" адзначаў, што ў Латвіі, які і Заходняй Беларусі, Праваслаўная царква "*ўсё яшчэ застаецца ў руках маскоўскіх чарнасоценцаў, якія вядуць самую рашучую*

быў абраны новы ачольнік ЛПЦ, якім стаў мітрапаліт Аўгустын (Петэрсонс), былы вайсковы капелан. Новы ўладыка абраў курс на інтэнсіўную інтэграцыю царквы з дзяржавай, а таксама пачаў фарсіраваць увядзенне латышскай мовы ў набажэнства. А. Гаврилин, *Попытки реформ в Латвийской Православной Церкви во второй половине 30-х годов XX века*, "Latopisy Akademii Supraskiej" 2015, t. 5, s. 175–179, 182–183.

[880] А. Гаврилин, *Попытки реформ в Латвийской Православной Церкви во второй половине 30-х годов XX века*, "Latopisy Akademii Supraskiej" 2015, t. 5, s. 182.

[881] Лад, *Усе 'русские' запісывайцеся Беларусамі*, "Наша доля" 1930, № 2 ад 7 лютага, с. 1.

[882] *Справядлівы крок латвійскага ўраду*, "Беларуская крыніца", № 5 ад 9 лютага 1930, с. 3.

[883] LVVA, 2125 f., 5 apr., 106 l., 13 lp.

барацьбу з усімі праявамі беларускага адраджэнчага руху, асабліва – з беларускімі школамі, агітуючы да ператварэння іх у расейскія"[884].

Беларуская прэса Латвіі таксама заўважала выпадкі адмоўнага стаўлення праваслаўных святароў да беларускай дзейнасці. На пачатку 1920-х гг. К. Езавітаў адзначаў, што мясцовае праваслаўнае духавенства нярэдка агітавала супраць адкрыцця беларускіх школ[885]. Удзельнікі нарады беларускага настаўніцтва Лудзеншчыны (Ляўдары, 5 студзеня 1930 г.) абмеркавалі пытанне непрыхільнага стаўлення да беларускага настаўніцтва з боку настаяцеля тамтэйшага прыхода а. Веніяміна Вазнясенскага, які "*будучы законаўчыцелем гэтых школ, беспадстаўна нападае на вучыцельства ў сваіх прамовах у царкве і гэтым перашкаджае прыходу і сабе, бо вучыцялі на чале з Е. Х. Хруцкім, які наладзіў добра царкоўны хор, перасталі хадзіць у царкву, хор распаўся*"[886]. Дэструктыўная роля некаторых святароў праявілася падчас перапісаў насельніцтва. Беларускія крыніцы інфармавалі, што былі духоўнікі, якія заклікалі вернікаў запісвацца рускімі, а не беларусамі[887]. На думку беларускіх актывістаў, духавенства, як праваслаўнае, так і каталіцкае, спрычынілася да пераводу шэрагу беларускіх школ у Рускі і Польскі школьныя аддзелы[888].

Ананімны аўтар (імаверна, С. Сахараў) артыкула *Праваслаўная царква і беларусы* на старонках газеты "Наша доля" шкадаваў, што Праваслаўная царква ў Латвіі не заўважае беларусаў сярод сваіх вернікаў і па-ранейшаму агорнутая русафільскімі тэндэнцыямі. На думку аўтара, Сінод ЛПЦ ігнаруе беларускія патрэбы дазваляючы асобным святарам выкарыстоўваць амбон

---

[884] LCVA, f. 368, ap. 1., b. 33, l. 280.

[885] LVVA, 2125 f., 5 apr., 40 l., 135 lp.

[886] *Як нас запісывалі*, "Наша доля" 1930. № 1 ад 26 студзеня. С. 4.

[887] *Праваслаўная царква і беларусы*, "Наша доля" 1930. № 3 ад 8 сакавіка. С. 3.

[888] Кастусь Езавітаў наступным чынам ацэньваў ролю святарства ў беларуска-руска-польскім змаганні за школы ў Латгаліі: "*Пачаўшаяся замена сваімі вучыцялямі вучыцялёў велікаросаў і палякаў вызвала сярод апошніх вялікае незадаволенне і перапалох. З мэтай утрымання за сабой пасадаў, яны павялі сярод мясцовага беларускага жыхарства агітацыю супраць беларускай мовы і школы, палохаючы баязлівых сялян-беларусаў рознымі страхамі: каталікам гаварылася, што беларуская мова ўводзіцца дзеля таго, каб іх русіфікаваць і аправаслявіць; праваслаўным, – што такім спосабам збіраюцца іх перавясці ў каталіцтва і апалячыць (...) Высокарэлігійныя беларускія масы, як каталіцкія, так і праваслаўныя, захвалявaліся і пачалі шукаць спосабу адхінуць небяспеку ад шчыра абараняемай веры сваіх бацькоў. Спосаб гэты тут жа ўслужліва падказваўся: адмова ад беларускай 'небяспечнай' мовы і перавод школаў у Велікарускі або Польскі аддзел. Рэзультатам гэтага ўзбунтавання думак была пастанова некалькіх школьных радаў беларускіх школ аб іх адказе ад беларускай мовы і аб жаданні з рэлігійнай мэтай, увясці ў гэтых школах некалькі лекцыяў польскай мовы; перайсці на выкладовую мову польскую бацькі не прасілі, бо і немагчыма было гэтага зрабіць дзеля неразумення гэтай мовы бацькамі і дзяцьмі*". К. Езавітаў, *Становішча беларускае школы ў Латвіі*, Вільня 1923, с. 21.

для антыбеларускай агітацыі. Адначасова ён заклікаў праваслаўных беларусаў Латгаліі аб'ядноўвацца і патрабаваць ад Сінода ўвядзення беларускай мовы ў царкву (казанні) і царкоўную асвету (выкладанне Закону Божага). Акрамя таго, аўтар лічыў, што беларускія таварыствы павінны звярнуцца да ачольніка ЛПЦ архіепіскапа Іаана, каб ён увёў вывучэнне беларускай мовы ў праграму духоўнай семінарыі[889]. Ніводзін з гэтых пастулатаў не быў рэалізаваны. Праўда, невядома, ці ў гэтым была віна толькі царкоўнікаў. Імаверна, беларускі актыў таксама не знайшоў у сабе моцы і жадання дабіцца ад царкоўнага кіраўніцтва такой згоды.

Кантакты беларускай інтэлігенцыі і праваслаўных святароў у Латвіі былі, аднак, непазбежныя. Хоць бы таму, што Закон Божы быў абавязковым прадметам і ў беларускіх школах. Пры гэтым часта святары не жадалі карыстацца беларускай мовай. Карэспандэнт газеты "Голас беларуса" апісваў выпадак, калі ў пэўнай беларускай школе мясцовы праваслаўны святар, які выкладаў Закон Божы, загадаў вучням размаўляць з ім толькі па-руску[890].

Ёсць згадкі пра тое, што настаяцелі вясковых прыходаў падбухторвалі сялян дабівацца ліквідацыі беларускіх школ і адкрыцця рускіх. Але былі таксама духоўнікі, якія спачувалі беларускаму руху. З даступных крыніц вынікае, што прабеларускую пазіцыю займаў а. Нікан Заліўскі, пробашч парафіі ў Прыдруі і а. Сцяпан Заліўскі, пробашч у Скрудаліне. Гэтыя святары не цураўся ўдзелу ў беларускім жыцці. Яны выкладалі Закон Божы ў беларускіх школах, належалі да беларускіх арганізацый[891]. Да беларускай дзейнасці прыхільна паставіўся а. Талбухін. Пазітыўна ў памяці беларускіх дзеячаў

---

[889] У артыкуле чытаем: "*З усяго гэтага мы, праваслаўныя беларусы Латвіі, павінны зрабіць адпаведныя вывады і прыняць рашучыя крокі к беларусізацыі праваслаўнай царквы, па прыкладу нашых братоў-беларусаў у Польшчы. У Латгаліі і Ілукшчыне ёсць некалькі праваслаўных прыходаў, гдзе ў пераважнай большасці жывуць беларусы. Трэба беларусам аб'ядноўвацца і вынясці на сваіх прыходзкіх сабраннях пастановы, каб бацюшкі казалі казанні ў царкве на беларускай мове, і каб выкладалі Закон Божы ў беларускіх школах абавязкова на беларускай мове. Дзеля падгатоўкі бацюшак у беларускія прыходы трэба ў духоўнай семінарыі ўвясьці выкладанне беларускай мовы. Адначасна культурна-прасветныя беларускія арганізацыі ў Латвіі павінны высвятліць гэта важнае пытанне на месцах і падаць адпаведны мемарыял архібіскупу праваслаўнай царквы ў Латвіі. Думаецца, што архібіскуп Ян, які па нацыянальнасці латыш, добра ўразумее рэлігійныя патрэбы праваслаўных беларусаў і выдасць свяшчэннікам распараджэнне карыстацца беларускай мовай у царкве праваслаўных беларускіх прыходаў, тым больш, што аб карыстанні пры набажэнствах роднай мовай народу (...) быў выдан наказ патрыярхам Маскоўскім Ціханам яшчэ ў 1922 годзе. А таму праваслаўныя беларусы аб'ядноўвайцесь і вымагайце ўвядзення беларускай мовы ў цэрквах і ў школах пры казаннях і выкладанні Закону Божага*". Праваслаўны беларус, *Праваслаўная царква і беларусы,* "Наша доля" 1930, № 3 ад 8 сакавіка, с. 2.

[890] *Беларускае жыцьцё ў Латвіі*, "Голас беларуса" 1926, № 10 ад 1 ліпеня, с. 4.

[891] *2-гі Зьезд дэлегатаў "Т-ва беларусаў-выбаршчыкаў у Латвіі" – Прывітаньне Зьезду Делегатаў*, "Голас беларуса" 1926, № 40, с. 1.

запісаўся настаяцель Стара-Слабодскага прыхода а. Аляксей Буднікаў, які ў 1923 г. заклікаў прыхаджанаў аддаваць дзяцей у беларускую школу[892]. Настаўнікам рэлігіі беларускіх сталічных школ быў а. Мікалай Македонскі, якога цёпла ўзгадвалі беларускія дзеячы. 26 чэрвеня 1930 г. школьная рада Даўгаўпілскай гімназіі прасіла БША зацвердзіць а. Саву Трубіцына настаўнікам Закону Божага, але пры ўмове, што святар будзе вучыць па-беларуску[893].

Беларускія ўстановы і актывісты кантактавалі не толькі з шараговым святарствам, але і з іерархамі ЛПЦ. Напрыклад, у 1923 г. Беларускі школьны аддзел звярнуўся да архіепіскапа Іаана з просьбай як мага хутчэй прызначыць святара ў Ляўдарскі прыход з магчымасцю выкладання Закона Божага ў мясцовай беларускай школе, бо папярэдні бацюшка, як іншаземец, страціў пасаду. Просьба была задаволеная[894]. Пятро Мірановіч сцвярджаў, што многія праваслаўныя клірыкі, якія спачатку вялі антыбеларускую прапаганду, з цягам часу перасталі гэта рабіць[895]. Вышэйзгаданыя прыклады паказваюць, што прынамсі частка праваслаўнага святарства здолела захаваць нейтральнае альбо памяркоўна-пазітыўнае стаўленне да беларускай справы. Цяжкасці ў дачыненнях з царкоўнікамі не выключалі магчымасці прыватнага ўдзелу беларускіх дзеячаў у рэлігійным жыцці. Напрыклад, М. Дзямідаў быў актыўным вернікам і нават псаломшчыкам рыжскай парафіі ў гонар Пакрову Св. Багародзіцы[896]. Падтрымліваў шчыльныя кантакты з кіраўніцтвам ЛПЦ С. Сахараў. У студзені 1925 г. ён ад імя БША накіраваў зварот архіепіскапу Іаану, у якім звяртаў увагу на гаротны стан Праваслаўнай царквы на Лудзеншчыне. Пры гэтым дзеяч лічыў, што адказнасць за гэта нясе мясцовае духавенства, якое нядбайна ставіцца да сваіх абавязкаў і не разумее духу часу[897]. Акрамя таго, плёнам супрацоўніцтва беларускага дзеяча з ЛПЦ стала выданне навуковых прац па гісторыі Праваслаўнай царквы ў Латгаліі. Беларускага дзеяча можна лічыць адным з летапісцаў латвійскага праваслаўя[898].

Беларуска-рускі канфлікт інтарэсаў знайшоў адлюстраванне ў прэсе абодвух лагераў. Найбольш непрыязную да беларусаў пазіцыю займала газета "Рижский курьер". У лютым 1922 г. на яе старонках з'явілася публікацыя,

---

[892] LVVA, 2125 f., 5 apr., 53 l., 1, 6 lpp.

[893] LVVA, 2067 f., 1 ap., 377 l., 24 lp.

[894] LVVA, 2125 f., 5 apr., 93 l., 20 lp.

[895] П. Мірановіч, *Беларусы ў Латвіі 1919–1944* [у:] *Крывіцкія руны. Вып. II: Беларускі культурны мацярык у Латвіі*, рэд. М. Казлоўскі, С. Панізнік, Менск 2017, с. 29.

[896] Э. Екабсонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [у:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 66.

[897] LVVA, 7131 f., 1 apr., 38 l., 4 lp.

[898] Ю. Петровский, *Церковный историк Сергей Сахаров* [у:] *Призвание – краевед: По материалам X Давгавпилсской краеведческой конференции*, ред. W. Filipow, Даугавпилс 2013, с. 5–14.

скіраваная супраць беларускай школьнай справы і яе актывістаў. Аўтар артыкула сцвярджаў, што ў беларускія школы дзяцей набіраюць несумленнымі метадамі: ім бясплатна раздаюць падручнікі і вопратку. Беларускі бок быў вымушаны адрэагаваць. Асабліва адчуў сябе пакрыўджаным К, Езавітаў, якога рускае выданне назвала "былым царскім палкоўнікам". Беларускі дзеяч звярнуўся ў рэдакцыю з афіцыйным лістом, патрабуючы надрукаваць абвяржэнне[899].

Да К. Езавітава далучыўся кіраўнік БША, які запатрабаваў ад рэдакцыі газеты выбачэнняў за публікацыю *Белорусские похоронные дроги* (выйшла ў нумары ад 6 лютага 1923 г.), аўтар якой абражаў нацыянальныя пачуцці беларусаў і аспрэчваў існаванне іх як народа. У лісце ў рэдакцыю С. Сахараў пісаў: "*Белорусс, прошедший свой многовековой тернистый путь, немного желает. Это желание один белорусский поэт выразил двумя словами 'людзьми звацца' т.е. свободно жить и свободно развавать свою культуру. Пусть эта культура не имеет пока за собой всесветных авторитетов науки, литературы и т.п., но ведь и всякая культура не с неба спустилась, а развивалась упорным, многовековым трудом, почему же белоруссу не дать возможности внести свой цветок, свою лепту на алтарь общечеловеческой и особенно славянской культуры, почему он не может брать из своего родного источника, а должен заимствовать готовое из других рук. Ведь и то, что создано до настоящего времени белоруссами в области своей национальной культуры и при самых неблагоприятных условиях жизни, говорит, что эта славянская народность способна к творческой работе, к созиданию великих ценностей. Белорусс хочет со всеми национальностями жить в мире и добрососедском согласии. Но это может установить лишь на почве взаимного понимания, уважения и человечности друг к другу. Пока же мы будем для одних требовать всех прав и культуры, а от других это неотъемливое право отнимать и подавлять, то еще долго жизнь будет из себя представлять 'взбаламученное море' и мы дальше 'похоронных дрог' друг для друга не додумается. 'Не рой другому ямы, сам в нее попадешь', это следует понимать и автору статьи 'похоронных дрог'*"[900].

Газета "Рижский курьер" не засталася ўбаку ад польска-беларускіх сварак. Рускія аўтары падзялялі пашыраны сярод польскіх дзеячаў погляд пра "штучнасць" беларусаў у Латвіі[901]. Рэдакцыя салідарызавалася з поглядамі дэпутата-паляка Я. Вежбіцкага, які на старонках выдання крытычна выказваўся наконт мясцовага беларускага руху. Палітык скептычна ставіўся да магчымасцей і перспектыў развіцця беларускай дзейнасці ў Латвіі. Дэпутат адзначаў: "*Нягледзячы на запэўніванні сп. Сахарава аб ажыўленні беларускай*

---

899 НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 19, л. 20–21; LVVA, 2125 f., 5 apr., 38 l., 9 lp.

900 LVVA, 2125 f., 5 ap., 105 l., 44 lp.

901 *Белорусския похоронныя дроги*, "Рижский курьер" 1923, № 625, с. 1.

культурна-асветнай работы, ніхто не верыць у гэта 'ажыўленне', паколькі яна ў нас ніколі не нараджалася і не паміралa"[902]. Артыкул польскага дзеяча выклікаў рэакцыю з боку беларускага актыву. Кіраўнік БША С. Сахараў запатрабаваў ад рэдакцыі надрукаваць абвяржэнне. Аднак рэдакцыя адмовілася задаволіць гэту просьбу. У выніку беларускі дзеяч быў вымушаны сам узяцца за пяро і апублікаваць на старонках рускага выдання артыкул, які разбіваў аргументы нядобразычліўцаў. Ён пісаў, што беларуская меншасць у Латвіі гэта рэальнасць, а не прыдумка палітыкаў. Дыскусію з Вежбіцкім на старонках вышэйзгаданага рускага выдання вёў таксама К. Езавітаў[903]. З'яўленне на старонках газеты "Рижский курьер" артыкулаў польскіх аўтараў падаецца невыпадковым: газета лічылася рускай, але выдавалася за польскія грошы[904]. Публікацыя польскага дэпутата ў газеце рускай меншасці дала беларускім дзеячам чарговую нагоду сцвярджаць, што палякі і рускія ў стане аб'яднаць сілы ў "Польска-рускі саюз" для змагання з беларусамі. Кастусь Езавітаў лічыў, аднак, антыбеларускія высілкі дарэмнымі: "*У Латвійскай рэспубліцы няма ні расейскага гарадавога, ні польскага жандара. Стасаваць да нас у Латвіі аружную ды паліцэйскую сілу польскія паны ды расейскія чарнасоценцы ня маюць магчымасці, а таму мы спакойна можам гуртаваць нашы беларускія сілы, каб даць рашучы адпор расійска-польскім панам-рэакцыянерам*"[905]. Сваю думку лідар латвійскіх беларусаў працягнуў у іншай публікацыі: "*У арганізацыі беларусаў і ў стварэнні беларускіх*

---

[902] Я. Вержбицкий, *Еще о латвийских белоруссах*, "Рижский курьер" 1923, № 642, с. 2–3; *Ответ г. Езовитову,* "Рижский курьер" 1923, № 654, с. 3. Вось як пісаў на гэты конт К. Езавітаў: "*Уважаемые союзники разделили между собой сферы их работы: г. Вержбицкий работает над белоруссами католиками, которых хочет сделать поляками, а г. Корецкий подстрекает белоруссов православных и хочет сделать их 'просто русскими'. Г. Вержбицкий пугает белоруссов католиков православием, а депутат Корецкий говорит белоруссам православным, что их хотят сделать католиками. Оба собирают и вымогают разные заявления, распространяют нужные сплетни и оба же одновременно и дружно выступают против белоруссов в Сейме и Сеймовых комиссиях. К. г.г. депутатам присоединились даже Русский и Польский Отдел при Министерстве Образования. С согласия этих отделов в Иллустском Уезде, где еще нет белорусских школ, среди белорусского населения Русский Отделом основаны особого типа русско-польские школы. Учаться в этих школах белоруссы католики, не говорящие по-польски, ни по-русски. Родители и дети прекрасно панимают, что они не русские, ибо, во-первых, не знают русского языка, а говорят как-то по-своему, 'по-простому', а во-вторых – все они католики. По религиозному признаку согласны были бы считать себя поляками, но польский язык слышат только в костеле и в польском поместье и говорить на нем не могут*" LVVA, 2125 f., 5 apr., 106 l., 16 lp.

[903] *Письмо в редакцию*, "Рижский курьер" 1923, № 654, с. 3.

[904] Юрий Абызов, *20 лет русской печати в независимой Латвии*, http://www.russkije.lv/ru/pub/read/rus-in-latvia-edition2/abizov-rus-latvii-2.html

[905] К. Езавітаў, *Нечаканае сяброўства*, "Голас беларуса" 1927, № 9 ад 25 траўня, с. 2.

меншасцёвых таварыстваў, як расійскія манархісты, так і польскія шавіністы ўбачылі пагрозу сваім уплывам у Латгаліі, убачылі, што ў іхнюю векавечную барацьбу за душы беларускага народа ўступае новая сіла, свядомая беларуская інтэлігенцыя, якая будзе весці змаганне за тое, каб беларусы не зрабіліся ні палякамі, ні расійцамі, а каб трымаліся свайго роднага беларускага"[906].

Асабліва аўтары "Рижского курьера" атакавалі беларускія школы ў гарадах: Даўгаўпілсе, Лудзы і Краславе. У адным з артыкулаў наконт школы ў Краславе чытаем: "*Мы, граждане города, в недоумении и задаёмся вопросом, кому нужна та белорусская школа при наличии четырёх школ (латышская, русская, польская и еврейская), которые далеко не переполнены. Неужели нельзя было избежать лишних, ничем не оправдываемых расходов на новую школу, устроив отделение, скажем, в русской школе, с преподаванием отдельно белорусского языка, если в этом чувствуется надобность, в чем, кстати сказать, сомневаемся. Ко всему вышесказанному надо прибавить, что в Краславке жителей всего около 4-х тысяч, а белоруссы среди них единицы*"[907]. Супраць гэтай публікацыю выступіў кіраўнік беларускай школы ў Краславе, які прапанаваў кіраўніцтву БША адрэагаваць на "выбрыкі" рускіх[908].

У адказ С. Сахараў наступным чынам характарызаваў паводзіны рускіх дзеячаў: "*Они все еще не могут оставить мысль о том, что белоруссы должны находиться под их опекой, и все еще рассматривают белорусскую национальную работу в Латвии, как 'обиду' и 'предательство' общих интересов. До этого времени эти русские еще не оставили надежду на то, что им снова удасться объединить 'в одну общую русскую семью' и белоруссов и великоруссов. Для этой святой цели не жалеют они сил на сыпание красивых слов и искренне ярких доказательств, не останавливаясь перед самыми необоснованными упреками, не задумаваються над употреблением клеветы в прессе, как напр. газета 'Рижский курьер', а иногда не останавливаются даже и перед ходатайством к Латвийскому правительству*"[909].

Аднак гэта не спыніла з'яўлення новых антыбеларускіх публікацый на старонках згаданага выдання. У траўні 1923 г. з'явіўся артыкул, аўтар якога сцвярджаў, што сярод вучняў Краслаўскай школы шмат носьбітаў латышскіх, а не беларускіх прозвішчаў[910]. Рускі бок выкарыстоўваў унутраныя праблемы беларускіх школ. Напрыклад, у публікацыях звярталася ўвага на нізкае наведванне школ і праблемы з педагагічнымі кадрамі[911].

---

[906] К. Езавітаў, *op. cit.*, с. 53.

[907] М. Сахачевский, *Школа белоруссов без учеников*, "Рижский курьер" 1922, 10 ноября, с. 3.

[908] LVVA, 2125 f., 5 ap., 146 l., 16 lp.

[909] LVVA, 2125 f., 5 apr., 106 l., 12 lp.

[910] LVVA, 2125 f., 5 ap., 146 l., 42 lp.

[911] LVVA, 1632 f., 2 apr., 493 l., 166 lp.

Адзін з аўтараў звяртаў увагу на "ўсеагульнае адмоўнае стаўленне" мясцовага насельніцтва да адкрыцця беларускіх школ, а ў якасці прыкладу "народнага супраціву" сцвярджаў, што няяўка вучняў на занятках складае больш за 70%. Аўтар свядома ігнараваў факт, што кепскае наведванне тлумачылася ўдзелам у сельскагаспадарчых працах, а не негатыўным стаўленнем да беларускасці[912].

Падчас беларускага працэсу рускамоўная прэса ўзяла ўдзел у цкаванні. Выданне "Рижский курьер" надрукавала інфармацыю пра звальненне К. Езавітава з пасады кіраўніка Лудзенскай гімназіі і мапу БНР, знойдзеную ў беларускіх школах. У адказ Беларускі школьны аддзел запатрабаваў ад рэдакцыі абвяржэння. Аднак, рэдакцыя адмовілася, спасылаючыся на тое, што не ўводзіць чытачоў у зман, а толькі паўтарае тое, што кажуць улады і піша латвійская прэса[913]. На старонках газеты "Народ" А. Аляксандраў пісаў пра тое, што павелічэнне ў 1925 г. колькасці рускіх і змяншэнне ліку беларусаў на Лудзеншчыне было вынікам "тлумачальнай" працы рускіх дзеячаў сярод мясцовага жыхарства[914]. Пасля заканчэння працэсу руская прэса пісала, што латвійскія ўлады рыхтуюць новыя наступы. Беларуская прэса адрэагавала заклікам не слухаць плётак і не паддавацца на правакацыі ды застрашванне. Аўтары супакойвалі і заклікалі ўсіх актывістаў і прыхільнікаў працягваць працаваць на беларускай ніве[915]. Беларускі бок лічыў, што прадстаўнікі рускай меншасці спрычыніліся да таго, што ў 1924–1925 гг. кіраўнікі беларускага руху апынуліся на лаве падсудных. Напрыклад, К. Езавітаў у вытоках беларускага працэсу бачыў руку "расійскіх чарнасоценцаў". У якасці доказу сваіх словаў ён прыводзіў тое, што значную частку сведак абвінавачання складалі асобы рускай нацыянальнасці[916]. Аднак аналіз крыніц дазваляе пацвердзіць толькі факт удзелу газеты "Рижский курьер" у цкаванні беларускіх лідараў падчас следства.

Аналізуючы змест "Рижского курьера", неабходна адзначыць, што выданне не адлюстроўвала поглядаў усіх рускіх дзеячаў. Больш за тое, у асяроддзі рускіх інтэлектуалаў Латвіі газета лічылася "возмутителем спокойствия" і знаходзілася ў вострым канфлікце з іншымі мясцовымі рускімі перыёды-

---

[912] Тамсама.

[913] *Белоруссы оправдываются*, "Рижский Курьер" 1924, 26 апреля, с. 2.

[914] *Вынікі беларускага працэсу*, "Голас беларуса" 1925, № 2 ад 20 чэрвеня, с. 1; *Яшчэ аб выніках беларускага працэсу*, "Голас беларуса" 1925, № 3 ад 1 ліпеня, с. 1.

[915] *Ня бойцеся правакацыйных слухаў і застрашваньняу*, "Голас беларуса" 1926, № 4 ад 1 траўня, с. 1.

[916] LVVA, 3235 f., 6 apr., 196 l., Рукапіс брашуры К. Езавітава *Беларускі процэс у Латвіі*. У іншай сваёй працы К. Езавітаў пісаў, што абвінавачанні грунтаваліся "*на розных плётках, абгаворах ды чутках, распушчаных у Дзвінску расейскімі чарнасоценцамі ды польскімі панамі*". К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, Рыга 1927 [перадрук: Нью-Ёрк – Менск 2013], с. 110.

камі (перадусім газетай "Сегодня"). Нягледзячы на гэта, многія іншыя рускія выданні прытрымліваліся падобных поглядаў на беларускі рух. У кастрычніку 1925 г. на старонках газеты "Двинский голос" з'явіўся вялікі артыкул ананімнага аўтара пад назвай *Белорусское самоопределение и школьная политика*, у якім аўтар крытыкаваў працу Беларускага школьнага аддзела і інспектара К. Езавітава. Аўтар называў беларусаў адгалінаваннем "вялікага рускага народа", а іх мову – "речью" сцвярджаючы, што беларусы карыстаюцца ёй толькі ў хатнім побыце альбо "для забавы", а ў сапраўднасці схіляюцца да рускай культуры і мовы. Ён бачыў шлях духоўнага адраджэння беларусаў выключна ў рэчышчы рускай культуры, а таксама здзекаваўся з беларускай культуры, якую лічыў штучнай, а беларускую літаратуру – бесперспектыўнай. Існаванне беларускай нацыі аўтар называў прыдумкай "*группы злополучных дельцов под названием 'Белорусской республики'*". Ён крытыкаваў працу беларускіх школ у Латвіі за тое, што ў іх мурах гучала адразу некалькі моваў, а гэта, на думку аўтара, перашкаджала школьнаму працэсу. Аўтар вінаваціў К. Езавітава ў звальненні настаўнікаў, якія не валодаюць беларускай мовай альбо не жадаюць карыстацца ёй у навучанні. Публіцыст называў беларускую школьную дзейнасць шкоднай і згубнай для асветы ў Латгаліі, паколькі "*падзел працы паміж двума аддзеламі, вялікарускім і беларускім, у выкананні асветнай функцыі ў адносінах да адной рускай меншасці, замест чаканага павышэння вытворчасці ад іх супольных высілкаў, непазбежна пацягне за сабой развал і разруху ў навучальнай справе, да істотнай шкоды маладога пакалення, якое патрабуе асветы*"[917].

На старонках гэтага ж выдання К. Езавітаў адказаў рускаму аўтару. Беларускі дзеяч даводзіў, што беларуская культура мае трывалыя гістарычныя традыцыі і не з'яўляецца штучным творам нямецкай акупацыйнай палітыкі часоў І сусветнай вайны. У якасці навуковых доказаў існавання беларускай мовы і культуры аўтар спасылаўся на даследаванні праф. Яўхіма Карскага. Тым часам, прычыну нізкага ўзроўню беларускай нацыянальнай свядомасці ён бачыў у русіфікатарскай палітыцы царызму[918].

Непрыхільныя да беларусаў матэрыялы з'яўляліся на старонках рускай сялянскай газеты "Деревня". Так, аўтар аднаго з артыкулаў даводзіў, што беларуская мова незразумелая насельніцтву Латгаліі і страшыў, што сялянскія дзеці будуць прымусова яе вывучаць, калі бацькі аддадуць іх у беларускія школы[919].

---

[917] М. Б., *Белорусское самоопределение и школьная политика (Два слова о деятельности председателя белорусского Культурно-просвятительнаго общества г. К. Б. Езовитова)*, "Двинский голос" 1925, № 9 за 25 октября, с. 3–4; Тамсама, № 11 от 13 октября, с. 2.

[918] "Двинский голос" 1925, 21 декабря, с. 3.

[919] *Ворагі*, "Наша доля" 1930. № 4 ад 7 красавіка, с. 1.

З непрыхаванай антыпатыяй да беларусаў ставіліся аўтары і выдаўцы рускай нацыянал-дэмакратычнай газеты "Слово". На старонках выдання крытыкавалі беларускі рух, беларускія школы, К. Езавітава і яго "Голас беларуса". Беларускіх кіраўнікоў вінавацілі ў тым, што яны перашкаджалі працы рускіх школ, беларускі рух называлі савецкай агентурай. Беларускія школы называлі штучнай з'явай, якой ніхто не хоча, нават настаўнікі, якія там працуюць[920]. У газеце "Слово" з'явілася зацемка пра тое, што беларускія школы павінны быць перададзеныя ў падпарадкаванне інспектара рускіх школ[921]. З беларускага боку на згаданыя публікацыі рэагавалі аўтары і выдаўцы "Голасу беларуса"[922].

Беларускія аўтары дыскутавалі з рускімі апанентамі і на старонках іх прэсы. Акрамя К. Езавітава ў рускіх перыёдыках выказваўся С. Сахараў – ён друкаваўся ў выданнях "Сегодня", "Латгальская мысль", "Двинский голос", "Наш Даугавпилский голос". На старонках "Двинского голоса" ён аспрэчыў меркаванне Г. Садоўскага пра адсутнасць у беларусаў самастойнай культуры[923]. Беларускі актыў рэгулярна адказваў на крытыку рускіх аўтараў, выкарыстоўваючы не толькі публічную дыскусію, але і суды. Кіраўнік БША звярнуўся да пракурора Рыжскага акружнога суда з просьбай распачаць следства ў сувязі са з'яўленнем на старонках аднаго з перыёдыкаў інфармацыі, якая дыскрэдытавала ў вачах грамадскасці Беларускі школьны аддзел[924]. У студзені 1923 г. К. Езавітаў прапанаваў С. Сахараву выслаць ад імя БША скаргу на артыкул Е. Спірыдонава "Всеславянский Студенческий Конгресс в Праге", у якім аўтар напісаў няпраўду, асвятляючы ўдзел у гэтым мерапрыемстве беларусаў. У прыватнасці, рускі аўтар адзначыў, што беларуская дэлегацыя "была состряпана украінцами", а таксама тое, што Янка Станкевіч не ведае добра беларускай мовы. Адказваючы на гэты дэмарш, К. Езавітаў звярнуў увагу на тое, што віленскі беларус Янка Станкевіч з'яўляецца аўтарам шэрагу салідных прац па беларускай мове[925].

У адрозненні ад згаданых рускіх перыёдыкаў, штодзённая газета "Сегодня" займала больш памяркоўную пазіцыю ў адносінах да латвійскіх беларусаў і іх нацыянальных патрэб. У 1920-я гг. дадзены перыёдык лічыўся самым

---

[920] Н. Бордонос, *Что скрывается под белорусским национализмом в Латвии*, "Слово" 1926, № 332, с. 2.

[921] *Беларускі Аддзел, не дапушчай расейцаў да нашых спраў*, "Голас беларуса" 1926, № 29 ад 22 снежня, с. 2.

[922] К. Езавітаў, *Расейскія рэакцыянеры зноў пачалі паход проціў беларускае меншасьці ў Латвіі*, "Голас беларуса" 1926, № 28 ад 15 снежня, с. 2–3.

[923] М. Ліс, *Літаратурна-публіцыстычная дзейнасць С.П. Сахарава* [у:] *Інфармацыйнае забеспячэнне навукі: праблемы, пошукі, рашэнні. Зборнік навуковых артыкулаў*, Менск 2000, с. 131.

[924] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 107, л. 19.

[925] LVVA, 2125 f., 5 apr., 38 l., 754 lp.

паспяховым і ўплывовым рускамоўным выдавецкім праектам у Латвіі. Кіраўніцтва БША падтрымлівала прыязныя адносіны з рэдакцыяй, пра што сведчыць віншавальны ліст з нагоды 5-годдзя выдання[926]. На старонках газеты друкаваліся звесткі пра падзеі ў беларускім культурна-асветным жыцці, аўтары захоўвалі стрыманасць у ацэнках. Беларускі бок палічыў гэта за праяву эвалюцыі мыслення рускага інтэлектуальнага асяроддзя, якое рана ці позна мусіла пагадзіцца з існаваннем беларускай ідэнтычнасці[927]. У падобным тоне пра беларусаў пісаў рыжскі "Колокол" (рэдактар-выдавец С. Самойлаў). Газета пазбягала ацэнак, толькі канстатавала факты. Напрыклад, на старонках выдання з'явілася зацемка пра выпадак, калі рыжская прэфектура адмовілася запісаць у пашпарце Ніне Пінскай беларускую нацыянальнасць, спасылаючыся на тое, што такой не існуе[928]. Нейтральную пазіцыю займала і газета "Русская жизнь", якая падчас беларускага працэсу абмяжоўвалася пералікам сухіх фактаў пра затрыманне беларускіх дзеячаў[929].

Падсумоўваючы агляд беларускай праблематыкі на старонках рускай прэсы ў міжваеннай Латвіі, можна зрабіць выснову, што апошняя не была ідэйным маналітам, а наадварот, адлюстроўвала прысутнасць унутры рускай супольнасці ў Латвіі розных грамадска-палітычных плыняў і напрамкаў – ад нацыяналістаў і манархістаў да лібералаў і дэмакратаў. Аднак, нягледзячы на ідэйную разнастайнасць, большасць выданняў захоўвала адзінства ў поглядах на беларускую праблематыку. На старонках рускіх перыёдыкаў пераважалі артыкулы крытычныя ў дачыненні да беларускай нацыянальна-культурнай дзейнасці ў Латвіі і беларускага руху ўвогуле. Рускія аўтары выкарыстоўвалі любую нагоду, каб "ушчыкнуць" беларускіх дзеячаў. Пры гэтым менавіта рускі бок задаваў тон дыскусіі, паколькі публікацыі беларускіх актывістаў былі рэакцыяй на праявы крытыкі. Адным з галоўных аб'ектаў для нападкаў з'яўляўся К. Езавітаў. У перыяд арганізацыі школ рускія дзеячы крытыкавалі яго працу на пасадзе інспектара беларускіх школ. Беларуса вінавацілі ў дыскрымінацыі (затрыманне заробку, блакада авансу, спробы звальнення з працы) настаўнікаў, якія не жадалі праслухаць настаўніцкія курсы. Абвінавачанні былі скіраваныя не столькі супраць асабіста К. Езавітава, колькі супраць беларускіх школ як такіх. Аўтар фельетона *Школьная инициатива белорусского самоопределения* вінаваціў беларускага дзеяча ў хамскіх паводзінах у дачыненні да рускіх настаўнікаў, якія не жадалі падпарадкавацца загадам[930].

---

[926] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 107, л. 16.

[927] *Расейская прэсса аб днях беларускай культуры*, "Голас беларуса" 1929, № 2 ад 22 ліпеня, с. 1.

[928] *Запрещенная нация*, "Колокол" 1925, № 3 от 16 августа, с. 3.

[929] *Дело о Белорусской республике в Латвии*, "Русская жизнь" 1924, № 17 от 5 июня.

[930] LVVA, 1632 f., 2 apr., 493 l., 156–161, 163–164 lpp.

Нагодай да дыскусіі паміж беларускімі і рускімі дзеячамі былі перапісы насельніцтва. У іх час абвастраліся супярэчнасці паміж лагерамі, якія дыяметральна па-рознаму каментавалі вынікі. Як вядома, з кожным перапісам шораз менш грамадзян дэкларавала беларускую нацыянальнасць. Гэта давала рускім актывістам нагоду сцвярджаць, што беларуская меншасць у Латвіі з'яўляецца штучнай з'явай, створанай маладой латвійскай дзяржавай на патрэбы бягучай палітыкі. У сувязі з гэтым рускія аўтары прадракалі хуткі канец беларускаму руху ў краіне. Напрыклад, выданне "Народ", каментуючы вынікі перапісу насельніцтва ў 1925 г. сцвярджала, што ў хуткім часе ад латвійскіх беларусаў застанецца толькі "жменька кіраўнікоў". Рэакцыя беларусаў не прымусіла доўга чакаць. "Голас беларуса" кпіў, каментуючы сцвярджэнне рускага выдання словамі: "Смачны жабе гарэх, ды зубоў няма"[931].

Прадметам увагі ўдзельнікаў пасяджэння цэнтральнай управы ТБВ 3 верасня 1926 г. быў змест выдання *Русский календарь на 1925 год*, які ўтрымліваў артыкул *Белорусский вопрос*. Аўтар аспрэчваў вынікі перапісу 1920 г. у Латгаліі, сцвярджаючы, што скарачэнне ліку мясцовых рускіх было вынікам механічнага запісвання беларусамі насельніцтва на правы бок ад чыгункі Рэжыкнэ – Зілупе[932]. У артыкуле даводзілася шкоднасць беларускай дзейнасці для расійскіх інтарэсаў у Латвіі. Адзначалася, што больш як 40 расійскіх школ было прымусова перададзена БША. Аўтар выказваў, аднак, надзею, што Рускаму школьнага аддзелу на чале з Ф. Н. Сярковым удасца гэтыя школы вярнуць. У публікацыі даводзілася, што ў Латвіі няма беларусаў. Аўтар спасылаўся на даследаванні праф. Мітрафана Доўнар-Запольскага, які, нібыта, сцвярджаў, што беларусаў у межах Латвіі няма. Рускі аўтар таксама адзначаў, што неабходна правесці асветную працу сярод мясцовага насельніцтва, каб падчас перапісаў яно не запісвалася беларусамі. Выхад календара выклікаў абурэнне дзеячаў ТБВ, якія лічылі, што яго аўтары ціснуць на беларускае насельніцтва, каб змяніць на сваю карысць нацыянальную статыстыку ў часе хуткага перапісу[933]. Кіраўніцтва ТБВ вырашыла падаць у суд на выдаўцоў і аўтараў рускага календара, абвінавачваючы іх у пашырэнні хлуслівых звестак, якія абражаюць гонар і годнасць беларускай меншасці ў Латвіі[934].

Разам з тым беларускія дзеячы намагаліся зразумець, чаму колькасць беларусаў у Латвіі змяншаецца. Беларуская прэса, з аднаго боку, аспрэчвала сумленнасць перапісаў, а з другога – вінаваціла нядобразычліўцаў. Газета

---

[931] *Яшчэ аб выніках беларускага працэсу*, "Голас беларуса" 1925, № 3 ад 1 ліпеня, с. 1.

[932] LVVA, 2125 f., 5 apr., 75 l., 52 lp.

[933] *2-гі Зьезд дэлегатаў "Т-ва беларусаў-выбаршчыкаў у Латвіі"*, "Голас беларуса" 1926, № 40, с. 3.

[934] LVVA, f. 3009, apr. 1, l. 3, 91–92 lpp.

“Наша доля”, каментуючы вынікі перапісу 1930 г., пераконвала, што на яго вынік паўплывала антыбеларуская дзейнасць мясцовай рускай інтэлігенцыі. Рэдакцыя вінаваціла інспектара рускіх пачатковых школ, дырэктара Лудзенскай рускай гімназіі і дэпутата гарадской думы Калініна ў тым, што яны запісвалі рускімі ўсіх вучням рускіх школ, не зважаючы на тое, што сярод іх былі прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей, у тым ліку беларусы[935]. 26 студзеня 1930 г. з’езд прадстаўнікоў беларускай нацыянальнай меншасці ў Латвіі прыняў рэзалюцыю, якая тычылася наступнага перапісу насельніцтва. Дакумент утрымліваў такія высновы: 1) латвійскія статыстычныя органы не заўсёды адрозніваюць беларусаў ад велікарусаў, залічваючы іх у адну групу “рускія”, што вядзе да памылак у высновах і падліках, а таксама спрыяе таму, што праваслаўныя беларусы атаясамліваюць сябе з рускімі; 2) напярэдадні перапісу 1925 г. сярод беларускага сялянства “шавіністычна-рэакцыйныя колы” пашыралі чуткі, што тыя, хто запішацца беларусам, будуць рэпрэсаваныя, таму людзі заяўлялі пра рускую нацыянальнасць; 3) з гэтых прычын колькасць беларусаў паводле перапісу 1925 г. належыць прызнаць заніжанай. Каб прадухіліць падобнае падчас перапісу 1930 г. з’езд пастанавіў: 1) беларускім арганізацыям і школам, свядомым нацыянальным сілам правесці шырокую кампанію па пад’ёму нацыянальнай свядомасці насельніцтва ў сваіх раёнах. З гэтай мэтай два тыдні перад перапісам абвяшчаліся тыднямі беларускай нацыянальнай свядомасці; 2) рашуча пратэставаць супраць атаясамлівання статычнымі органамі беларусаў і рускіх[936].

Надзвычай важна было дамагчыся адмовы ад выкарыстання ў працы статыстычных камісій назвы “рускія” ў дачыненні да беларусаў. На думку беларускіх дзеячаў, ва ўспрыманні непісьменных і малапісьменных беларускамоўных сялян тэрміны “рускі” і “праваслаўны” былі тоесныя, таму выразны падзел “беларусаў” і “велікарусаў” праз адмову ад рубрыкі “рускія” ў перапісным фармуляры дапаможа людзям зрабіць выбар на карысць беларускасці. Удзельнікі з’езду прынялі рашэнне выслаць дэлегацыю ў Латвійскае статыстычнае ўпраўленне, каб растлумачыць, што слова “krievu” павінна выкарыстоўвацца толькі ў дачыненні да асоб рускай нацыянальнасці[937]. На гэты конт выказалася і беларускае настаўніцтва Лудзеншчыны, якое падчас нарады 5 студзеня 1930 г. прыняло пастанову: “*Нарада беларускага вучыцельства ў мэтах больш справядлівага вызначэння нацыянальнасці просіць Цэнтральнае Статыстычнае Упраўленне пры апытанні нацыянальнасці не карыстацца тэрмінамі ‘русскій’, але ўжываць толькі тэрміны ‘веліка-*

[935] *Як нас запісывалі*, “Наша доля” 1930, № 3 ад 8 сакавіка, с. 3.

[936] Прысутны, *Зьезд Белар. Нацыянальнай Меншасьці ў Латвіі*, “Наша доля” 1930, № 2 ад 7 лютага, с. 2.

[937] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 100, л. 26.

рус', 'беларус', 'маларус', а таксама просіць не дапушчаць у якасці перапісчыкаў асоб, вядомых у Істрэнскай воласці сваімі непрымірымым і варожым адношаннем да беларусаў і вядучых увесь час у гэтай воласці шкодную працу натраўлівання аднэй нацыянальнасці на другую"[938].

Рашэнне латвійскіх улад не выкарыстоўваць у 1930 г. азначэнне "рускі" выклікала незадаволенасць рускага боку. Віктар Вальтар так тлумачыў ліхаманку рускіх актывістаў: "*Вялікадзяржаўныя сны не даюць спакою расейскім дзеячам, прыхільнікам 'вялікай і недзялімай Расеі'. Цені мінулага праносяцца перад іх вачыма, як прывіды, і яны з воўчым апетытам гатовы схапіць усё ў свае расейскія абоймы (...) не дарма, даўней Расея лічылася 'турмой народаў'. І вось, гэтыя вялікадзяржаўныя дзеячы старашэнна абураны, што Латвійскае Статыстычнае Упраўленне загадала пад час перапісу 'ні ў якім разе не ўжываць слова 'рускій', -- але абавязкова зазначаць, -- велікарус, беларус, маларус'. Здавалася б, што можна было б сказаць процію гэтай пастановы (...) Думаем таксама, што не дарма гэтыя расейцы паднялі трывогу. Чуюць яны, што беларусы гатовы прачнуцца, гатовы не даваць ім ні аднаго чалавека, як было пры ранейшых перапісах, -- які яны называлі б вялікадзяржаўным назовам 'рускій'. Беларусам гэта вялікадзяржаўнасць не патрэбна. Яны хочуць толькі, каб ім далі магчымасць развіваць сваю родную мову, сваю песню, сваю школу, сваю культуру, каб іх не стрыглі пад адну мерку 'рускій', як авечку. Прыйшоў, сапраўды, час засведчыць не толькі на ўсю Латвію, але і на ўвесь свет, што беларусы ў Латвіі ёсць, што яны хочуць жыць, і падобна іншым народам 'людзьмі звацца'*"[939].

Праз розніцу беларускіх і рускіх інтарэсаў, кіраўніцтва беларускіх арганізацый адмоўна ставіліся да ўдзелу сваіх сяброў у грамадска-культурных мерапрыемствах рускай меншасці. Гэта тычылася таксама настаўнікаў і вучняў беларускіх школ, якім не рэкамендавалася ўдзельнічаць, напрыклад, у "Днях рускай культуры"[940]. І ўсё ж паміж беларускімі і рускімі актывістамі існавала прыватныя сувязі. Многія беларускія дзеячы (К. Езавітаў, С. Сахараў, М. Дзямідаў, С. Сіцько, А. Родзька, Я. Кастылюк) мелі сяброўскія адносіны з некаторымі рускімі актывістамі. Дзіва ў гэтым няма, калі ўзяць пад увагу, што ўсе гэтыя людзі атрымалі асвету і рабілі першыя кар'ерныя крокі ў дарэвалюцыйнай Расіі, былі часткай расійскага вайсковага, настаўніцкага ці чыноўніцкага апарату.

Аднак характэрнай рысай кантактаў беларускіх дзеячаў з рускімі было жаданне першых надаць ім нефармальны (прыватны) характар. 28 ліпеня 1922 г. К. Езавітаў у лісце С. Сахараву не пратэставаў супраць сяброўства

---

[938] LVVA, 2125 f., 5 apr., 47 l., 24 lp.

[939] В. Вальтэр, *Б'юць трывогу!...*, "Наша доля" 1930. № 2 ад 7 лютага, с. 3.

[940] *Беларускае жыццё ў Латвіі*, "Голас беларуса" 1926, № 10 ад 1 ліпеня, с. 4.

апошняга з дзеячамі Нацыянальна-дэмакратычнага саюза, але перасцерагаў, каб той не ўступаў у настаўніцкі саюз, які ствараўся пры гэтай арганізацыі. Кастусь Езавітаў лічыў, што гэта дасць нядобразычліўцам з ліку латгальскіх палітыкаў нагоду вінаваціць беларусаў у тым, што яны братаюцца з рускімі і праводзяць русіфікацыю. Беларускі дзеяч пісаў: "*Наогул (гэта) пашкодзіць нашым нацыянальным інтарэсам, якія нацыянал-дэмакратычны хаўрус бароніць толькі часова і якія мы мусімо бараніць самі. Таксама ніхто з членаў т-ва 'Бацькаўшчына' не павінен запісвацца ў гэты хаўрус. Хай тамака працуюць велікарусы*"[941]. Аналіз крыніц дазваляе меркаваць, што беларускім дзеячам было лягчэй знайсці супольную мову з рускімі стараверамі. Кіраўнік БША С. Сахараў тлумачыў гэта тым, што, у адрозненні ад праваслаўных, якія паходзілі з былога царскага апарата, стараверы ў мінулым самі былі прыгнечаныя расійскай дзяржавай, таму лепей разумелі патрэбы іншых народаў[942].

Беларуска-рускія адносіны ў Латвіі кантраставалі з дачыненнямі паміж мясцовымі беларусамі і ўкраінцамі. Праўда, з прычыны нешматлікасці апошніх у Латвіі, захаваліся толькі сціплыя звесткі пра беларуска-ўкраінскія кантакты ў гэтай краіне. Тым не менш, вядома, што яны існавалі паміж асобнымі прадстаўнікамі беларускай і ўкраінскай супольнасці. У прыватнасці, К. Езавітаў атрымліваў запрашэнні да ўдзелу ў культурных мерапрыемствах, якія ладзіў Жаночы камітэт Латвійска-ўкраінскай грамады[943].

* * *

Падсумоўваючы агляд беларуска-польскіх і беларуска-рускіх дачыненняў у Латвіі, належыць адзначыць, што яны не былі станоўчымі. Кожны лагер бачыў у іншых канкурэнтаў і нават ворагаў. Галоўнай прычынай канфлікту была розніца інтарэсаў нацыянальных эліт. Усе тры бакі ажыццяўлялі нацыянальна-культурную экспансію ў дачыненні да славянамоўнага насельніцтва Латвіі, нацыянальная свядомасць значнай часткі якога знаходзілася ў стадыі фармавання. Асноўным адрасатам нацыянальнай агітацыі беларускага, польскага і рускага рухаў былі жыхары Латгаліі, якія ў хаце размаўлялі па беларуску, але маліліся па-польску ці па-руску. Як польскія, так і рускія дзеячы бачылі пагрозу ў беларускім руху, які паволі займаў свае месца на нацыянальным і грамадска-палітычным краявідзе Латвіі. Сутыкненне польскіх і рускіх інтарэсаў з беларускімі адбывалася падчас арганізацыі нацыянальных школ, перапісаў насельніцтва, парламенцкіх выбараў, а нават у каталіцкіх і праваслаўных храмах. Трыбунай для ўзаем-

[941] LVVA, 2125 f., 5 ap., 42 l., 125 lp.

[942] LVVA, 2125 f., 5 apr., 106 l., 12 lp.

[943] HI, Collection K. Yezovitov, Запрашэнне К. Езавітава, 8 жніўня 1934 г.

най крытыкі найчасцей была прэса. Належыць адзначыць, што абвінавачванні з усіх бакоў у большасці выпадкаў не адпавядалі рэчаіснасці. Усе тры бакі канфлікту мелі досыць стэрэатыпнае і спрошчанае ўяўленне адзін пра аднаго. Польскія і рускія дзеячы недаацэньвалі малады беларускі рух, аспрэчвалі яго магчымасці самастойнага існавання і называлі штучным. Яны не бралі пад увагу факту, што мясцовая беларускасць існуе і пачынае набываць арганізаваныя формы. Лідары польскіх і рускіх таварыстваў не маглі пагадзіцца з рэчаіснасцю, прызнаць, што беларускасць у Латвіі з'яўляецца натуральнай і нармальнай з'явай. У сваю чаргу, беларускія дзеячы памылкова разглядалі мясцовых палякаў і рускіх як нешматлікую, але ўплывовую групу "папоў, ксяндзоў, палітыкаў-чарнасоценцаў, паноў і абшарнікаў". Яны адмаўлялі існаванне ў Латвіі польскіх і рускіх сялян, лічылі іх спаланізаванымі і зрусіфікаванымі беларусамі. Найбольш яскрава беларуска-польскія і беларуска-рускія супярэчнасці праявіліся ў школьнай сферы. Не павінны здзіўляць словы кіраўніка Беларускага школьнага аддзела, якімі ён падагульніў становішча беларускай школьнай справы ў Латвіі ў першыя гады існавання: "*Чым болей культурна-прасветная праца сярод беларускае насельнасці пашыраецца і ўмацоўваецца, тым болей яна спаткае і благажаданнікаў. У Дзвінскім павеце – палякі, у Люцынскім павеце – расейцы і палякі, а іх падтрымліваюць яшчэ латгальцы, летуцеючы аб аўтаноміі Латгаліі. Сярод гэтых трох варожых элементаў беларуская школа павінна прачышчаць сабе шлях, не маючы к таму ж у некаторых месцах цвёрдай апоры і ў вучыцельстве*"[944].

Беларуска-польскія і беларуска-рускія разыходжанні па ключавых пытаннях былі сярод асноўных прычын таго, што лідары латвійскіх беларусаў не далучыліся да палітычнага блоку нацыянальных меншасцей, ідэя якога была ў супрацоўніцтве з мэтай супольнай і эфектыўнай барацьбы за нацыянальныя правы. Кастусь Езавітаў так тлумачыў пазіцыю беларусаў: "*Першае, што зрабілася зусім ясным для кіруючае групы ў Т-ве 'Бацькаўшчына', гэта тое, што ніводная меншасцёвая група не падтрымае беларусаў у іхняй працы. Славуты 'адзіны фронт меншасцяў' быў не для беларусаў – беларусам у гэтым адзіным фронце не было месца (…) Тутака, у Латвіі, паўтаралася ў мініятуры тое, што беларусы ўжо мелі магчымасць назіраць у сваім агульнабеларускім адраджэнчым руху: вялікадзяржаўныя нацыі, меўшыя прэтэнзіі на поўную асіміляцыю беларусаў, не маглі быць сябрамі нованароджанае беларускае меншасці*"[945]. Гэты ж дзеяч пісаў у БША ў верасні 1922 г.: "*Мы не можам ісці ў агульным фронце з іншымі нацыянальнымі меншынствамі, бо вядзём увесь час барацьбу з расейцамі і палякамі, якія хочуць абмаскаліць і апаля-*

[944] LVVA, 2125 f., 5 ap., 7 l., 67 lp.; НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 110, л. 7.

[945] К. Езавітаў, *op. cit.*, с. 56.

чыць наш народ"[946]. Добра разумеючы палітычную кан'юнктуру, К. Езавітаў звяртаў увагу на патрэбу нагадаць латвійскім уладам, што "*не трэба дапушчаць русіфікацыі і паланізацыі беларускага нацыянальнага меншынства, бо гэта зусім не ў інтарэсах Латвійскай Рэспублікі*"[947].

Беларуска-польскі і беларуска-рускі канфлікты інтарэсаў у міжваеннай Латвіі былі непазбежныя. Яны з'яўляліся вынікам нацыятворчых працэсаў на тэрыторыі са шматэтнічным насельніцтвам. Міжнацыянальныя адносіны ў латвійскай дзяржаве не былі чымсьці незвычайным, аналагічна сітуацыя выглядала на іншых этнічных памежжах. Паўсюль, дзе побач існавалі розныя нацыянальныя рухі, раней ці пазней у эпоху нацыяфармавання паміж імі даходзіла да канфліктаў. Адносіны беларусаў з палякамі і рускімі ў Латвіі былі лакальным адлюстраваннем тагачасных беларуска-польскіх і беларуска-рускіх дачыненняў у шырэйшым маштабе. У стаўленні беларускага нацыянальнага актыву да палякаў і рускіх дарэмна шукаць паланафобіі ці русафобіі. Гэта была відавочная рэакцыя прадстаўнікоў "маладой" нацыі, якая шукаючы ўласнага месца ў занятай раней "гістарычнымі" нацыямі нацыянальна-культурнай і грамадскай прасторы, мусіла змагацца за права "народам звацца". Сведчаннем таго, што прадстаўнікі мясцовага беларускага руху добра разумелі сваё становішча і пастаўленыя перад сабой задачы, з'яўляцца артыкул у газеце "Наша доля". Аўтар адзначаў, што адказам латвійскіх беларусаў на напады з боку нядобразычліўцаў павінна быць арганізацыйная праца на карысць роднай культуры і нацыянальнага ўсведамлення насельніцтва[948].

---

[946] LVVA, 2125 f., 5 ap., 39 l., 59 lp.

[947] LVVA, 2125 f., 5 ap., 39 l., 59 lp.

[948] У гэтым артыкуле чытаем: "*Мы павінны проста сказаць, што беларусы не жадаюць вясці барацьбу ні з велікарусамі, ні з палякамі. Але для гэтага яны павінны прызнаць, што беларуская нацыянальная меншасць маець такое-ж права на існаваньне і развіццё сваей культуры, як і кожны народ, і што іх братні абавязак не толькі не шкодзіць беларусам у іх нацыянальнай працы, а наадварот, спагадаць ёй. Калі ж некаторыя з іх колы, захопленыя старымі вялікадзяржаўнымі тэндэнцыямі і персанальнымі інтарэсамі, маюць заалагічнае жаданне праглаціць беларусаў і ставяць перашкоды іх культурнаму ўзросту, дык беларусы рашуча павінны сказаць: 'Прэч вашы брудныя рукі ад нашага працоўнага народа'*". Стары беларус, *Праўда пераможа (25 III. 1918 г.–25 III. 1930 г.)*,"Наша доля" 1930. № 4 ад 8 красавіка. С. 2.

РАЗДЗЕЛ V

Пад аўтарытарным кіраваннем (1934–1940)

Травеньскі пераварот 1934 года і яго ўплыў на становішча беларускай меншасці

Сусветны эканамічны крызіс выклікаў завастрэнне міжнацыянальных адносін. Правыя сілы ў латвійскай дзяржаве ўсё мацней патрабавалі абмежаваць нацменаў у сферы культуры, адукацыі, гаспадаркі і палітыкі. Нацыяналістычныя ідэі рабіліся папулярнымі не толькі сярод крайняй правіцы, але і сярод палітыкаў-цэнтрыстаў. Палітычныя сілы, якія стварылі новы ўрад падчас сусветнага эканамічнага крызісу, выказваліся за жорсткі курс у дачыненні да нацменаў. Прадстаўнікі Дэмакратычнага цэнтра ў траўні 1934 г. патрабавалі змены лозунгу "Латвія – дзяржава народа Латвіі" на "Латвія для латышоў". Стаўленне да нелатышоў пагаршалася адначасова з ростам незадавальнення дэмакратычным ладам і дзейнай Канстытуцыяй як "не вельмі латышскай".

На пачатку 1930-х гг. у Латвіі абвастрыўся палітычны крызіс, вынікам якога была нестабільнасць улады. У траўні 1933 г. спыніў існаванне правацэнтрысцкі кабінет Маргерса Скуеніекса (*Marģers Skujenieks*). Замест яго, пасля шасці тыдняў востpай дыскусіі, быў сфарміраваны новы ўрад на чале з Адольфсам Блодніексам (*Ādolfs Bļodnieks*). Эканамічны крызіс і палітычныя змены ў рэгіёне (Польшча, Літва) спрыялі антыдэмакратычным настроям. Частка грамадства бачыла прычыны палітычнай нестабільнасці ў празмерна ліберальным дзяржаўным ладзе. Многія пачалі баяцца, што разгайданы палітычнай свабодай дзяржаўны човен можа раптам перакуліцца. Антыдэмакратычным тэндэнцыям спрыяла адсутнасць у краіне неабходнай для дэмакратыі сацыяльнай базы: сярэдні клас быў кволы і нешматлікі, а сялянства не лічыла дэмакратыю каштоўнасцю. Многія ўплывовыя інтэлектуалы (літаратары, публіцысты), якія стаялі ля вытокаў

латвійскай дэмакратыі, пачалі схіляцца на бок крытыкаў дэмакратычнага ладу. Палітычны канфлікт паміж даўнімі апанентамі – сацыял-дэмакратамі і правым Латвійскім сялянскім саюзам – скончыўся паразай першых.

15 траўня 1934 г. у краіне адбыўся дзяржаўны пераварот, які ажыццявіў Карліс Ульманіс, кіраўнік ЛСС. Пасля пераварота быў сфармаваны "кааліцыйны" ўрад некалькіх правых партый (Латвійскі сялянскі саюз, Нацыянальнае аб'яднанне, Партыя новых гаспадароў, Дэмакратычны цэнтр і інш.), але ў рэальнасці ўся паўната ўлады засяродзілася ў руках К. Ульманіса. Па сутнасці гэты палітык увёў аўтарытарнае кіраванне. Парламент быў расфарміраваны, а дзейнасць дэмакратычнай Канстытуцыі і палітычных партый спыненая. Пасля пераварота ў краіне было абвешчана 6-месячнае ваеннае становішча. Змоўшчыкі, змяніўшы палітычны лад, спрабавалі вырашыць палітычны і эканамічны крызіс у краіне. Ульманіс лічыў, што сваімі дзеяннямі ён уратаваў Латвію ад бязладдзя і хаосу, якія ёй пагражалі без "моцнай рукі". Пасля пераварота грамадзянскія свабоды, у тым ліку правы мясцовага самакіравання, былі істотна абмежаваныя, а гарадское самакіраванне ўвогуле ліквідаванае. Паводле закона, прынятага 25 траўня 1934 г., функцыі гарадскіх дум узялі на сябе чыноўнікі, прызначаныя МУС. Павятовае самакіраванне таксама апынулася ў руках дзяржавы. Новая ўлада ўвяла ў краіне палітычную цэнзуру.

Пераварот і ўсталяванне аўтарытарнага ладу былі наступствам адсутнасці ў латвійскім грамадстве трывалай палітычнай культуры, а таксама празмерных амбіцый палітыкаў. Рэжым К. Ульманіса ў гістарычнай літаратуры называюць "Латвіяй 15 траўня". Па сутнасці, гэта была нацыянальна-кансерватыўная дыктатура. Функцыі распушчанага Сойма былі ўскладзеныя на ўрад, цалкам падуладны адной асобе. Характэрнай рысай дыктатуры ў Латвіі быў прынцып правадырства. Ульманіс лічыўся "паўнамоцным прадстаўніком народа і дзяржавы", а ўрад быў выканаўцам волі правадыра. Ульманіс зыходзіў з прынцыпу "надпартыйнага" кіравання краінай, калі ўсе галіны грамадска-палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця засяроджваліся ў адных руках. Праўда, захавалася пасада прэзідэнта (да вясны 1936 г. ім быў Альбертс Квіесіс, (*Alberts Kviesis*), але ён не меў значнага ўплыву. А з красавіка 1936 г. Ульманіс спалучаў функцыю прэм'ер-міністра з пасадай прэзідэнта. Нягледзячы на канцэнтрацыю паўнаты ўлады ў руках адной асобы, кіраванне Ульманіса нельга назваць крывавым. У краіне не было масавых рэпрэсій, не выкарыстоўвалася смяротнае пакаранне. Рэжым 15 траўня заставаўся стабільным на працягу ўсяго існавання, а апазіцыя была кволая і раз'яднаная. Ва ўмовах унутранай палітычнай і эканамічнай стабільнасці краіны аўтарытарная дыктатура не мела патрэбы выкарыстоўваць дзяржаўны тэрор супраць апанентаў. Частка палітыкаў з канкурэнтных партыі Ульманіса сіл падчас пераварота

і адразу пасля яго была арыштаваная і інтэрнаваная. У першую чаргу такі лёс напаткаў сацыял-дэмакратаў. Аднак у хуткім часе яны былі вызваленыя і адпраўленыя на пенсію[1].

Травеньскі пераварот і ўсталяванне аўтарытарнага кіравання істотна змянілі нацыянальную палітыку Латвіі. Як адзначалася раней, яшчэ ў часы парламенцкай дэмакратыі на пачатку 1930-х гг. узмацніліся нацыяналістычныя настроі. Тым не менш, да сярэдзіны 1934 г. яны не выходзілі за межы ваяўнічай рыторыкі. Пасля пераварота Ульманіс, як прадстаўнік правых сіл, галоўную задачу бачыў ва ўмацаванні пазіцыі латышскага народа. Невыпадкова, многія латышы запомнілі Ульманіса менавіта як абаронца іх нацыянальных правоў і імкненняў, дзякуючы якому яны адчулі сябе сапраўднымі гаспадарамі ва ўласным доме. Праўда, улады намагаліся ўлагоджваць празмерныя нацыянальныя антаганізмы, сцвярджаючы неаднаразова, што "сонца Латвіі ўсім свеціць аднолькава". Так, міністр-прэзідэнт М. Скуеніекс у прамове 23 траўня 1934 г. адзначыў, што дзяржава не збіраецца праследаваць нацменаў і рабіць іх жыццё "горкім і немагчымым". Аднак гэта былі словы, а ў рэальнасці істотнай часткай аўтарытарнай ідэалогіі стала ідэя нацыянальнай дзяржавы, "узнаўлення нацыянальнай справядлівасці" і стварэння "латышскай Латвіі". Гэтых мэтаў належала дасягнуць, забяспечыўшы латышам вядучую ролю ў эканамічным, культурным і палітычным жыцці.

Пасля 1934 г. узмацніўся кірунак на "латышызацыю", які прадугледжваў паступовае абмежаванне ўплыву нелатышоў у розных сферах жыцця: эканоміцы, асвеце, культуры. Нацменаў "выціскалі" з гандлёвых і прамысловых прадпрыемстваў, прадукцыя і капітал канцэнтраваліся ў латышскіх руках. Новы закон аб мовах ад 15 чэрвеня 1934 г. уводзіў абмежаванні ўжывання нацыянальных моваў у дзяржаўных установах і органах самакіравання. Латышская мова рабілася адзінай, якая дапускалася ў дзяржаўных і мясцовых органах улады, а таксама падчас грамадскіх сходаў. На выкарыстанне іншай мовы падчас імпрэз, мітынгаў і сходаў належала атрымаць спецыяльны дазвол МУС. Палітычныя партыі нацыянальных меншасцей спынілі існаванне адразу пасля пераварота праз забарону дзейнасці ўсіх палітычных сіл у краіне. У другой палове 1930-х гг. спыніў дзейнасць шэраг грамадскіх і культурна-асветных арганізацый нацменаў. Палітычная паліцыя забараніла іх пад выглядам змагання з "нядобранадзейнымі" і "антыдзяржаўнымі" сіламі[2].

---

[1] Больш падрабязна пра пераварот і яго наступствы гл.: *История Латвии, XX век*, Д. Блейере, И. Бутулис, А. Зунда и др., Рига 2005, с. 161–179.

[2] P. Łossowski, *Kraje bałtyckie na drodze od demokracji parlamentarnej do dyktatury: 1918–1934*, Wrocław 1972, s. 253–254, 261–263.

Выразным паказнікам змены палітыкі ў дачыненні да нацыянальных меншасцей была сітуацыя з асветай. Пасля 1934 г. пачаўся наступ на школьную аўтаномію, колькасць школ для прадстаўнікоў нелатышскай нацыянальнасці зменшылася. Новы міністр асветы Людвігс Эрнэстс Адамовічс (*Ludvigs Ernests Adamovičs*) у размове з журналістамі паабяцаў рашучыя змены ў нацыянальнай палітыцы. Неўзабаве, 12 ліпеня 1934 г., быў прыняты новы закон аб адукацыі, што фактычна перакрэсліў аўтаномію для нацыянальных меншасцей у галіне асветы. У адпаведнасці з ім, школы нацменаў маглі наведваць толькі вучні нелатышскай нацыянальнасці. Тым часам, дзеці з мяшаных шлюбаў, мусілі хадзіць выключна ў латышскія школы[3]. Пераломным момантам у ліквідацыі школьнай аўтаноміі было скасаванне ў тым жа годзе школьных аддзелаў і стварэнне на іх месцы рэферэнтур, падпарадкаваных Агульнаму школьнаму дэпартаменту Міністэрства асветы. На чале апошняга стаяў кс. Я. Чаманс, былы кіраўнік Даўгаўпілскай дзяржаўнай беларускай гімназіі[4]. Колькасць нелатышскіх школ скарачалася шляхам ператварэння іх або ў латышскія, або ў нацыянальна-мяшаныя. Трэба, аднак, адзначыць, што нацыянальная палітыка Ульманіса не мела расісцкага характару. Яе галоўнай мэтай было, хутчэй, умацаванне пазіцый латышоў і наданне Латвіі больш латышскага характару, чым дэнацыяналізацыя меншасцей як такіх[5].

Змены ў нацыянальнай палітыцы адмоўна паўплывалі на стан усіх нелатышскіх нацыянальных груп, але асабліва балюча іх адчулі беларусы як найменш арганізаваная і незаможная група нацменаў. Беларускія дзеячы мусілі падкрэсліваць лаяльнасць да новых улад, каб пазбегнуць пераследу. Сведчаннем гэтага можа быць пасяджэнне Таварыства беларускіх настаўнікаў у Латвіі, удзельнікі якога даслалі прывітальную тэлеграму Ульманісу. Прысутны на мерапрыемстве К. Езавітаў так каментаваў гэты крок у лісце віленскаму беларусу Язэпу Найдзюку: "*Пратэставаць супроць пасылкі тэлеграмы было немагчыма, гэта значыла б, што ўсіх пратэстантаў улада загадала б 'завесіць' і нават зусім выкінуць з Т-ва. А калі б аказалася большасць, дык і ўсё Т-ва было б зачынена. Пішу гэта не для прэсы, а толькі для ведама і для гісторыі сучаснага нашага палажэння*"[6]. Трэба адзначыць, што беларускія дзеячы не вылучаліся суперлаяльнасцю, паколькі падобныя заявы зрабілі кіраўнікі арганізацый іншых нацменаў (рускія, палякі).

---

[3] J. Albin, *Polski ruch narodowy na Łotwie w latach 1919–1940*, Wrocław 1994, s. 162.

[4] *Paśla dziarżaŭnaha pierawarotu ŭ Łatwii*, "Беларуская крыніца" № 24 ад 5 чэрвеня 1934 г., с. 2.

[5] A. Topij, *Polityka narodowościowa Łotwy w okresie rządów autorytarnych Kārlisa Ulmanisa (1934–1940)*, "Studia Historica Gedanensia" 2017, t. VIII, s. 279.

[6] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 94, л. 14.

Не было ў гэтым нічога надзвычайнага і дзіўнага, яны кіраваліся рацыянальным прынцыпам самазахавання. Верагодна, што лідары нацменаў усведамлялі, што ім не належыць чакаць нічога добрага ад кіравання Ульманіса, але адначасова разумелі, што павінны, як прадстаўнікі нятытульнай нацыі, прыстасавацца і жыць у згодзе з любой уладай, якая панавала ў краіне.

Дэманстрацыя лаяльнасці не ўратавала, аднак, беларусаў (разам з іншымі нацменамі) ад далейшых захадаў новага ўрада, скіраваных на абмежаванне грамадскай і культурна-асветнай актыўнасці. Некаторыя беларускія актывісты сталі ахвярамі рэпрэсій адразу пасля пераваротy. Гэты тычылася сяброў партыі латвійскіх сацыял-дэмакратаў або тых, хто быў вядомы левымі поглядамі. Варта, аднак, адзначыць, што яны трапілі пад рэпрэсіі не праз сваю нацыянальнасць, а таму, што былі звязаныя з палітычнай апазіцыяй. Арышты не абмінулі У. Пігулеўскага і К. Езавітава. Іх узялі пад варту 15 траўня як асоб, якія былі "актыўнымі дзеячамі арганізацый, шкодных для латвійскіх інтарэсаў"[7]. Першы, пабыўшы ў Рыжскай цэнтральнай турме, быў інтэрнаваны ў Ліепайскім лагеры з іншымі апанентамі Ульманіса[8]. 13 жніўня 1934 г. яго жонка, Вольга Бароўская-Пігулеўская, звярнулася да ўлад з просьбай вызваліць мужа. Яна падкрэслівала, што яе муж, у адрозненне ад іншых левых палітыкаў, ніколі не ўдзельнічаў у антыдзяржаўнай працы, не набыў, дзякуючы палітыцы, багацця, а да сацыял-дэмакратаў далучыўся кіруючыся тым, што партыя была вельмі папулярная ў Латгаліі. Жанчына звяртала ўвагу, што падчас вобшуку на кватэры Пігулеўскіх паліцыя не знайшла ніякай антыдзяржаўнай літаратуры. Яна запэўнівала, што пасля вызвалення яе муж паабяцае не далучацца да якіх-колечы сіл, якія маглі б шкодзіць новаму дзяржаўнаму ладу[9]. Ужо 16 жніўня палітычная паліцыя рэкамендавала МУС вызваліць У. Пігулеўскага з лагера[10]. І сапраўды, ён падпісаў абавязальніцтва, што ўстрымаецца ад дзейнасці, шкоднай дзяржаве, а таксама не зменіць месца жыхарства без ведама паліцыі. Разам з тым

[7] LVVA, 1632 f., 2 apr., 5445 l., 1 lp.

[8] Заслугоўвае ўвагі тое, што навіна пра затрыманне кіраўніка Беларускага школьнага аддзела выклікала розную рэакцыю беларускага настаўніцтва. Частка педагогаў з энтузіязмам успрыняла заняпад кар'еры У. Пігулеўскага. Вось якім чынам яго арышт пракаментаваў С. Сахараў: "*Беларусы рады, што збавіліся ад пігулеўшчыны, якая нічога не давала карыснага, а давяла беларускую справу да заняпаду*" (*Крывіцкія руны. Вып. III: Беларускі культурны мацярык у Латвіі*, уклад., прадм., камент.: М. Казлоўскі, С. Панізьнік, Менск 2019, с. 119). Такі погляд падзялялі некаторыя іншыя настаўнікі. Эмілія Казак-Казакевіч лічыла, што У. Пігулеўскі не праяўляў ніякай актыўнасці на беларускай ніве (*Крывіцкія руны. Вып. III: Беларускі культурны мацярык у Латвіі*, уклад., прадм., камент.: М. Казлоўскі, С. Панізьнік, Менск 2019, с. 176). Вышэйзгаданыя выказванні чарговы раз сведчаць пра нездаровую атмасферу вакол БША і яго кіраўніка.

[9] LVVA, 3235 f., 2 apr., 5445 l., 8–9 lpp.

[10] LVVA, 3235 f., 2 apr., 5445 l., 10 lp.

палітычная паліцыя інфармавала, што напярэдадні вызвалення з лагера беларус размаўляў з былымі партыйнымі таварышамі і абяцаў ім, што захавае адданасць партыі і прысязе, а таксама будзе дапамагаць жонкам інтэрнаваных палітыкаў[11]. Паліцыі стала таксама вядома, што У. Пігулеўскі з іншымі аднапартыйцамі на пачатку чэрвеня стварыў у лагеры патаемны камітэт, які шукаў аднадумцаў сярод вязняў і спрабаваў усталяваць сувязь з тымі, хто знаходзіўся на волі. Камітэтчыкі распрацавалі план: патрабаваць лепшага харчавання, а ў выпадку адмовы абвясціць галадоўку[12]. Нягледзячы на гэта, у жніўні У. Пігулеўскі быў вызвалены з лагера. 14 чэрвеня ён з'явіўся ў аддзеле палітычнай паліцыі і паінфармаваў пра месца свайго жыхарства (Рыжскі павет, маёнтак Шалюхіна)[13].

Тым часам, К. Езавітаў апынуўся ў Рыжскай турме, адкуль выйшаў 20 жніўня 1934 г.[14] Падчас знаходжання ў няволі (12 чэрвеня 1934 г.) ён быў зняты з пасады настаўніка ў адпаведнасці з пастановай МУС. 30 жніўня 1934 г. латвійскія ўлады прызначылі яму дапамогу на лячэнне[15]. Арышты закранулі рыжскі і даўгаўпілскі беларускі актыў. Напрыклад, у ліку затрыманых апынуліся настаўнікі Аляксей Барткевіч, Марыя Каспяровіч, Марыя Фёдарава і службовец даўгаўпілскай гарадской управы Алесь Сальцэвіч[16]. Вось як арышты беларускіх дзеячаў Латвіі каментаваў віленскі "Родны край": "*У арыштаваных адбыўся вобыск, аднак нічога, іх кампраметуючага, не было знойдзена. Латвійскія ўлады не змаглі ім прышпіліць ані паланафільства, ані саветафільства і трымаюць іх у арышце толькі за тое, што гэтыя людзі стойка бароняць інтарэсы беларускага народа. Гр. Езавітаву закідаюць даслоўна тое, што ён 'можа быць небяспечным для дзяржавы ў будучыні'. Так і просіцца да гэтых фактаў наступная дапіска: не змагла праглынуць беларусаў стомільённая белацарская, а цяпер чырвонабальшавіцкая чорная сотня, не праглыне іх і жменька рыжскіх дзікуноў*"[17]. Аднак у хуткім часе ўсе затрыманыя былі вызваленыя.

Ва ўмовах аўтарытарызму ўскладнілася грамадская актыўнасць. Працу грамадскіх арганізацый пільна кантралявала дзяржава. Кіраўнікі культурна-асветных таварыстваў мусілі ўзгадняць з уладамі кожны крок. Згодна з новым заканадаўствам, грамадскія арганізацыі маглі праводзіць сходы і пасяджэнні ўпраў толькі з дазволу паліцыі. Апошняя нярэдка адмаўляла, нават калі

[11] LVVA, 3235 f., 2 apr., 5445 l., 11–12 lpp.

[12] LVVA, 3235 f., 2 apr., 5445 l., 16–19 lpp.

[13] LVVA, 3235 f., 2 apr., 5445 l., 24–25 lpp.

[14] К. Езавітаў, *Кароткі жыццяпіс і праходжаньне службы*, с. 192.

[15] LVVA, 5213 f., apr. 16, 16514 lieta, lp. 3; НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 6, л. 2–14.

[16] Lawon Burny, *Z biełaruskaha życcia ŭ Łatwii*, "Беларуская крыніца" № 38 ад 28 кастрычніка 1934 г., с. 1.

[17] *У Латвіі*, "Родны край" № 18 ад 10 жніўня 1934 г., с. 4.

йшлося пра мерапрыемствы культурна-асветнага характару. Напрыклад, 27 студзеня 1935 г. на беларускіх настаўніцкіх курсах мелася выступіць курсантка і адначасова студэнтка Латвійскага ўніверсітэта Вераніка Слосман, але латвійскія ўлады не дазволілі. 2 лютага 1935 г. у мурах Рыжскай беларускай вячэрняй школы планавалася імпрэза з выкананнем беларускіх песняў. Аднак улады забаранілі мерапрыемства, даўшы дазвол толькі на пастаноўку камедыі *Модны шляхцюк*[18].

За першыя два гады аўтарытарнага кіравання была забаронена дзейнасць амаль усіх беларускіх грамадскіх арганізацый. Ужо ў верасні 1934 г. палітычная паліцыя прапанавала Аддзелу прэсы і таварыстваў МУС зачыніць Таварыства беларускай моладзі ў Латвіі. Падставай было тое, што сябры ўправы (К. Мяжэцкі, Я. Клагіш і старшыня М. Слосман) супрацоўнічалі з "нелегальнай беларускай арганізацыяй" пад кіраўніцтвам К. Езавітава, які ўплываў на дзейнасць таварыства. На пачатку 1935 г. у віну сябрам таварыства ставіўся распаўсюд нелегальнай беларускай літаратуры. Апрача таго, К. Мяжэцкаму і Я. Кудраўцову інкрымінавалі тое, што ўлетку 1935 г. яны праводзілі ў Латгаліі агітацыю за беларускі рух (Мяжэцкі быў арыштаваны і вызвалены толькі ў лютым 1936 г.). Узяўшы гэта пад увагу, 17 верасня 1935 г. кіраўніцтву ТБМЛ было загадана самаліквідавацца цягам трох месяцаў. Належыць, аднак, дадаць, што ў апошнія гады перад ліквідацыяй таварыства не праяўляла актыўнасці і налічвала ў той час толькі 45 дзейных сяброў[19].

Восенню 1935 г., пасля адмоўнай ацэнкі палітычнай паліцыі, спыніла дзейнасць таварыства "Рунь". 13 лістапада 1935 г. палітычнае ўпраўленне паліцыі адзначала, што сябра ўправы таварыства Баляслаў Блажэвіч раней браў удзел у камуністычнай дзейнасці ў Рызе і быў вядомы як камуністычны агітатар, за што ў 1930 г. атрымаў два гады пазбаўлення волі. Больш за тое, Б. Блажэвіч жыў у сталіцы без прапіскі[20]. 15 лістапада 1935 г. палітычнае ўпраўленне паліцыі адзначала, што большасць сяброў праўлення таварыства "Рунь" непрыхільна ставяцца да латвійскіх улад, таму належыць распачаць ліквідацыю арганізацыі. У выніку 29 лістапада 1935 г. дзейнасць таварыства была забароненая. Кіраўніцтва атрымала тры месяцы на тое, каб самаліквідавацца[21]. Неўзабаве такі самы лёс напаткаў таварыствы "Прасвета" і "Аратай", а таксама кааператыў "Культура і праца". Дзейнасць першага была спыненая 20 верасня 1935 г. з прычыны "шкоднасці для інтарэсаў грамадства

---

[18] *З беларускага жыцьця ў Латвіі*, "Беларуская крыніца" № 7 ад 5 1934 г., с. 3.

[19] Э. Екабосонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [в:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 68.

[20] LVVA, 3235 f., 5 apr., 3082 l., 5 lp.

[21] LVVA, 3235 f., 5 apr., 3082 l., 6–7 lpp.

і дзяржавы". У сувязі з гэтым таварыства "Беларуская хата" безвынікова прасіла перадаць ёй кнігазбор і радыёапараты, якімі валодала "Прасвета"[22].

Каб спыніць разгром культурна-асветных таварыстваў, беларускі актыў вырашыў у лістападзе 1935 г. выправіць да Ульманіса дэлегацыю, каб паінфармаваць кіраўніка краіны пра становішча беларускай меншасці і яе культурныя патрэбы. У склад дэлегацыі павінны былі ўвайсці: Р. Плыгаўка, К. Мяжэцкі, С. Сіцько, Я. Кастылюк і Я. Кудраўцоў. Тым часам, К. Езавітаў пачаў рыхтаваць петыцыю, які дэлегацыя мела ўручыць Ульманісу. Аднак у снежні 1935 г. Р. Плыгаўка быў паінфармаваны праз тэлефон з канцылярыі Ульманіса, што дэлегацыя не будзе прынятая. Беларускім актывістам было прапанавана перадаць свае пажаданні ў пісьмовай форме.

Тым часам, паступовая ліквідацыя беларускіх арганізацый працягвалася. Чарга прыйшла на Беларускае тэатральнае таварыства ў Латвіі. Напярэдадні ліквідацыі арганізацыя праяўляла нязначную актыўнасць. У 1934 і 1935 гг. рыжская трупа БТТЛ паказала некалькі спектакляў у Рызе ў рэжысуры У. Пігулеўскага[23]. Гэты былі пастаноўкі п'ес *Мікітаў лапаць*, *Ружовае павуцінне*, *Птушка шчасця*, *Культурная сіла*, *Сэрца не камень*[24]. Напрыканцы 1935 г. рыжская трупа налічвала 14 асоб[25]. Працягваліся таксама тэатральныя выступы ў Латгаліі. Захаваліся ўспаміны сведкаў наконт асобных пастановак. Напрыклад, 20 студзеня 1935 г. артысты выступілі ў Індры. Настаўніца беларускай школы Люцыя Александровіч, жонка К. Александровіча, так узгадвала гэты выступ: "*20 студзеня ў Індры быў баль. Было столькі людзей (...) Прыехаў Косцік. Паставілі п'есу 'Паўлінка', якую ён падрыхтаваў. Ён смяшыць мяне, калі хваліцца 'я рэжысёр' і камічна кашляе. Амаль усе артысты добра сыгралі. Публіцы гэта вельмі спадабалася, асабліва тая частка, дзе яны танцавалі і спявалі. Пасля спектакля святар запрасіў усіх гасцей з Даўгаўпілса на абед*"[26].

26 верасня 1935 г. кіраўніцтва БТТЛ упаўнаважыла У. Пігулеўскага ўвайсці ў склад дэлегацыі да кіраўніка ўраду з мэтай атрымання датацыі на тэатр[27].

---

[22] Э. Екабосонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [в:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 68.

[23] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 121–122, 124, 127 lpp.

[24] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 131 lp.

[25] Гэта былі: Я. Камаржынскі, Я. Каяла, Л. Тэтар, А. Крэйц, Юзэфа Даль, Я. Кудраўцоў, Сяргей Кудраўцоў, П. Масальскі, В. Доўгая, Г. Бедарава, М. Калінін, У. Гусарэвіч, Янка Доўгі, М. Слосман. LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 129–130 lpp.

[26] K. Kunicka, *A Pole Who Contributed to Belarusian Education and Cultural Life in Latvia: The Peculiar Case of Konstanty Aleksandrowicz* [in:] *In the shadow of others. Belarusian-Latvian Relations from the Past to Nowadays*, eds. Mirosław Jankowiak, Kiryl Kascian, Praha 2022, p. 384.

[27] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 123 lp.

26 кастрычніка 1935 г. В. Бароўская-Пігулеўская склала з сябе абавязкі старшыні таварыства ў сувязі з выездам у Рэжыкнэ на працу. Кіраўніцтва абрала новага старшыню М. Дзямідава і яго намесніка В. Доўгую[28]. У перыяд з 22 кастрычніка па 1 снежня 1935 гг. прыбытак таварыства склаў 262,69 лат, а выдаткі – 211,16. Аднак, з улікам сяброўскіх складак, у касе таварыства знаходзілася 207,64 латы[29]. 15 снежня 1935 г. адбыўся агульны сход сяброў БТТЛ (13 чал.) пад старшынствам Л. Тэтар і сакратара М. Калініна. Удзельнікі абралі наступны склад цэнтральнага праўлення: М. Дзямідаў (старшыня), Я. Камаржынскі (скарбнік), С. Сіцько (сябра), Я. Каяла (сакратар), Л. Тэтар (намесніца старшыні), П. Масальскі, В. Доўгая і А. Крэйц. У склад рэвізійнай камісіі ўвайшлі Ю. Даль, Я. Кудраўцоў, К. Мяжэцкі, кандыдаты Г. Бедарава і Юзэфская[30].

Новае кіраўніцтва планавала зладзіць некалькі выступаў: у студзені 1936 г. – *Модны шляхцюк* і *Чорт і баба*, у лютым – *Раскіданае гняздо* або *Сон на кургане* Я. Купалы. На 12 студзеня 1936 г. управа таварыства склікала сход артыстаў трупы, каб абмеркаваць бліжэйшыя планы. Адначасова цэнтральная ўправа пастанавіла інтэнсіфікаваць пошук творчых сіл сярод удзельнікаў беларускіх арганізацый і ўстаноў. Было вырашана збіраць пасяджэнні кіраўніцтва штотыдзень па серадах[31]. Аднак 25 студзеня 1936 г. МУС прыняло рашэнне ліквідаваць БТТЛ. На пасяджэнні 12 лютага 1936 г. старшыня азнаёміў сяброў праўлення з інфармацыяй, што на працягу трох месяцаў (29 студзеня – 29 красавіка) арганізацыя мусіць ліквідавацца[32]. Пасля гэтага адбыліся яшчэ дзесяць пасяджэнняў цэнтральнага праўлення (1, 16 і 23 красавіка, 2 і 13 траўня, 9, 18, 25 і 30 чэрвеня, 7 і 15 ліпеня), пратаколы якіх вяліся на латышскай мове. На апошнім пасяджэнні арганізацыя была ліквідаваная[33].

Прычынай ліквідацыі з'яўлялася прысутнасць у яго шэрагах "палітычна ненадзейных", да якіх залічваліся У. Гусарэвіч і М. Слосман. Першы ў мінулым належаў да партыі эсэраў, а потым да рускіх манархістаў і толькі пасля 1930 г. далучыўся да беларусаў, а другі лічыўся прыхільнікам К. Езавітава і напісаў шэраг артыкулаў у замежнай беларускай прэсе, выказваючы непрыхільнасць да латвійскай дзяржавы. Тым часам Вікторыя Доўгая характарызавалася як асоба, якую ў беларускім асяроддзі лічаць "великолепной дурой"[34].

Следам была ліквідаваная найстарэйшая беларуская арганізацыя ў Латвіі – таварыства "Беларуская хата". У 1935 г. у яе шэрагах налічвалася

---

[28] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 125 lp.
[29] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 128 lp.
[30] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 131–132 lpp.
[31] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 134–136 lpp.
[32] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 137 lp.
[33] LVVA, 1747 f., 1 apr., 20 l., 139–159 lp.
[34] LVVA, 3235 f., 5 apr., 255 l., 3 lp.

175 чал., у тым ліку: 75 – у Саркандаўгаўскім аддзеле, 15 – у Тарэнбергскім, 40 – у Ліепайскім, 30 – у Лудзенскім і 15 – у Даўгаўпілскім. Арганізацыя спрабавала пратрымацца ва ўмовах новай палітычнай рэчаіснасці, падкрэсліваючы сваю лаяльнасць да новай улады. Напрыклад, кіраўніцтва рэгулярна запрашала прадстаўніка Аддзела інфармацыі і прапаганды МУС Пятра Журкоўскага чытаць лекцыі для сяброў таварыства. Акрамя таго, 15 красавіка 1935 г. арганізацыя даслала вітанні Ульманісу. Аднак, гэта не ўратавала ад закрыцця. Паводле загаду Рыжскага акруговага суда 29 кастрычніка 1936 г. таварыства спыніла працу[35].

Адным з апошніх у жніўні 1936 г. было ліквідавана Беларускае навукова-краязнаўчае таварыства ў Латвіі. Палітычны аддзел МУС абгрунтаваў гэта тым, што таварыства не праяўляе актыўнай дзейнасці, у прыватнасці, не здолела выдаць нават беларуска-латышскі слоўнік, а таксама збор вуснай народнай творчасці. Трывогу палітычнай паліцыі выклікалі кантакты БНКТЛ з адпаведнымі замежнымі арганізацыямі, у тым ліку ў Вільні і ў Менску. Асаблівая ўвага звярталася на постаць старшыні таварыства К. Езавітава, вядомага левымі поглядамі і дзейнасцю, якая "пагражае знешняй і ўнутранай бяспецы краіны". Падкрэслівалася, што таварыства фактычна знаходзіцца ў руках Езавітава і яго жонкі. Палітычную паліцыю непакоілі кантакты Езавітава з Менскам, таемнае пашырэнне бээсэсэраўскай літаратуры сярод латвійскіх беларусаў, "*а таксама дзейнасць на карысць стварэння незалежнай Беларусі, у межах якой павінна была апынуцца частка латвійскай дзяржавы, дзе пражывае беларускае насельніцтва. З гэтай мэтай ён утрымліваў сувязь з правадырамі беларускага руху ў Беларусі і падтрымліваў беларусаў, выхаваных у беларускіх школах ад Латвіі да Менска*"[36]. У 1936 г. К. Езавітаў спрабаваў аднавіць таварыства, але ўлады не дазволілі[37].

Прасавецкія і левыя погляды беларускіх дзеячаў былі для аўтарытарнай улады толькі зручнай нагодай, каб ліквідаваць арганізацыі. У рэальнасці ўлада імкнулася абмежаваць прысутнасць нацменаў у публічнай сферы. Гэта пацвярджае факт, што ў жорны ліквідацыі трапілі грамадскія арганізацыі іншых нацменаў, якім складана было прыпісаць прасавецкія погляды. Напрыклад, у 1934 г. улады дэлегалізавалі найбуйнейшую арганізацыю польскай меншасці, Польскае нацыянальнае аб'яднанне, якое налічвала ў сваіх 35 аддзелах 2 205 сяброў[38].

---

[35] Э. Екабсонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [в:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 66–67.

[36] LVVA, 1897 f., 1 ap., 7 l., 8 lp.

[37] Э. Екабсонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [в:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 59.

[38] AAN, MSZ, t. 10475, Referat nt. Polacy na Łotwie, 1939, k. 18.

Якія-колечы праявы беларускай актыўнасці, якія ўлада кваліфікавала як палітычныя, рашуча спыняліся паліцыяй. Так, у лютым 1936 г. Былі арыштаваныя рыжскія настаўнікі Якуб Кастылюк, Сцяпан Сіцько, Рыгор Плыгаўка і Ян Кудраўцоў, Кастусь Езавітаў, студэнты Казімір Мяжэцкі і Вераніка Слосман[39]. У якасці доказу іх антыдзяржаўнай дзейнасці ўлады выкарысталі публікацыю "Наступ латышскага нацыяналізму на беларусаў", што з'явілася на старонках віленскай "Беларускай крыніцы" (№ 2 ад 16 студзеня 1936 г.). У артыкуле не выкарыстоўвалася ваяўнічая рыторыка, а толькі паведамлялася пра дзейнасць дзяржаўнай адміністрацыі ў дачыненні да беларускіх школ і магчымы візіт беларускай дэлегацыі да Ульманіса[40]. Кіраўнік Рыжскага аддзела палітычнай паліцыі сцвярджаў, што аўтары хлусілі наконт палітыкі латвійскіх улад у дачыненні да беларускай меншасці, пішучы, напрыклад, пра ліквідаваныя беларускія школы ў Латгаліі, якія ў рэальнасці яшчэ існавалі. Паліцыі не спадабалася, што аўтары артыкула прыпісалі К. Ульманісу словы, якіх ён ніколі не казаў: што не жадае сустракацца з беларускай дэлегацыяй[41]. Падчас ператрусу ў К. Езавітава было знойдзена шмат беларускіх выданняў, у тым ліку выданні "Новы шлях", "Наша воля", "Шлях моладзі", "Беларуская школа ў Латвіі", *Казка аб рыбаку і рыбцы*, а ў С. Сіцько – асобнік часопіса "Шлях моладзі"[42] 1 лютага вышэйзгаданыя беларусы былі абвінавачаныя па артыкуле 71 КК і дапытаныя рыжскай палітычнай паліцыяй[43]. 14 лютага следчыя Рыжскага аддзелу палітычнай паліцыі прасілі пракурора падоўжыць тэрмін затрымання іх на 6 тыдняў[44].

Падчас допытаў усе адмаўлялі ўдзел у нелегальнай беларускай арганізацыі, мэтай якой было зрабіць шкоду латвійскай дзяржаве. Кастусь Езавітаў сцвярджаў, што ведаў пра планы скіраваць беларускую дэлегацыю да Ульманіса і па просьбе іншых дзеячаў узяўся пісаць мемарандум, але з прычыны цяжкага матэрыяльнага становішча мусіў выехаць у правінцыю і не скончыў тую працу. Беларускі дзеяч таксама патлумачыў, чаму ён не ўстаў падчас выканання гімну на ўрачыстасці (12 студзеня) у 2-й беларускай школе. Ён сцвярджаў, што не пачуў аб'явы пра тое, што будзе выконвацца гэты твор, а да таго ж на каленях трымаў вучняў. Усе акрамя В. Слосман сцвярджалі, што не ведалі пра артыкул у віленскай газеце "Беларуская крыніца". Тым часам В. Слосман засведчыла, што яна прысутнічала ў кабінеце

---

[39] *Aryšty Birłarusaй u Łatwii*, "Беларуская крыніца" № 8 ад 16 лютага 1936 г., с. 2.

[40] *Наступ латыскага нацыяналізму на Беларусаў*, "Беларуская крыніца" № 2 ад 16 студзеня 1936 г., с. 1.

[41] LVVA, 1632 f., 2 apr., 6341 l., 1 lp.

[42] LVVA, 1632 f., 2 apr., 6341 l., 7, 33 lpp.

[43] LVVA, 1632 f., 2 apr., 6341 l., 14–48 lpp.

[44] LVVA, 1632 f., 2 apr., 6341 l., 10 lp.

Р. Плыгаўкі, калі беларусы даведаліся пра адмову Ульманіса прыняць дэлегацыю. Яна ўзгадвала, што ўсе былі разгубленыя і адчувалі сябе пакрыўджанымі. Дзяўчына перапісвалася з Янкам Шутовічам з Вільні, які рэдагаваў "Беларускую крыніцу". У сярэдзіне снежня яна напісала яму пра адмову Ульманіса прыняць беларусаў. Янка Шутовіч напісаў у газету зацемку, а ў студзені ці то ён, ці то Мар'ян Пецюкевіч даслаў В. Слосман асобнік, які апошняя перадала П. Журкоўскаму, каб ён праверыў праўдзівасць. Яна лічыла, што менавіта Я. Шутовіч быў аўтарам зацемкі, бо падпісаўся ініцыяламі "J.Š.". Беларуска запэўнівала, што яе ліст Я. Шутовічу меў прыватны характар, яна не ўпаўнаважвала інфармаваць прэсу пра яго змест[45]. Наступствы гэтага інцыдэнту былі такія, што К. Езавітаў і В. Слосман па шэсць тыдняў прасядзелі ў адзіночных камерах, абвясціўшы галадоўку ў знак пратэсту. Пасля вызвалення з-пад варты К. Езавітаў да 4 чэрвеня 1936 г. знаходзіўся пад хатнім арыштам[46].

Ад 1936 г. адзінай дзейнай грамадскай арганізацыяй беларускай меншасці было Таварыства беларускіх настаўнікаў у Латвіі. 4 чэрвеня 1937 г. быў абраны новы склад кіраўніцтва: П. Міpановіч (старшыня), М. Дзямідаў (намеснік старшыні), М. Слосман (сакратар), Я. Кудраўцоў (скарбнік), Я. Камаржынскі (сябра), Л. Тэтар і Марыя Даль (кандыдаты). Склад рэвізійнай камісіі быў наступны: С. Сіцько, М. Краўчанка, В. Дзяргач і кандыдаты: К. Мяжэцкі і А. Крэйц[47]. Палітычнае ўпраўленне паліцыі мела пытанні да некаторых сяброў кіраўніцтва ТБНЛ. У прыватнасці, у службовай нататцы (14 верасня 1937 г.) падкрэслівалася, што М. Слосман на загад К. Езавітава наведваў беларускія і рускія сем'і на Саркандаўгаве і праводзіў камуністычную агітацыю. Тым часам К. Мяжэцкага і Я. Кудраўцова вінавацілі ў тым, што восенню 1935 г. яны дзейнічалі ў нелегальнай беларускай палітычнай групе, што варожа ставілася да латвійскай дзяржавы. Акрамя таго, адзначалася, што К. Мяжэцкі быў звязаны з групай, якая публікавалася ў віленскай газеце "Беларуская крыніца"[48].

З другой паловы 1937 г. таварыствам кіраваў М. Дзямідаў, які, у адрозненні ад большасці іншых беларускіх настаўнікаў, працягваў займацца педагагічнай працай. З 1 жніўня 1935 г. ён атрымліваў сталую настаўніцкую пенсію. Тое, што гэты дзеяч здолеў утрымацца на паверхні на фоне пераследу іншых беларускіх актывістаў, было невыпадковым. Рэпрэсіі былі скіраваныя перадусім супраць асоб, звязаных з сацыял-дэмакратамі і прадстаўнікамі іншых левых плыняў, якія лічыліся галоўнымі палітычнымі

[45] LVVA, 1632 f., 2 apr., 6341 l., 50–52 lpp.

[46] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 6, л. 2.

[47] LVVA, 3235 f., 5 ap., 1619 l., 3 lp.

[48] LVVA, 3235 f., 5 ap., 1619 l., 5 lp.

апанентамі Ульманіса. М. Дзямідаў на момант пераварота не належаў да левых партый (яшчэ ў 1928 г. ён выйшаў з ЛСДРП). Была і яшчэ адна істотная прычына, якая тлумачыць лагоднае стаўленне ўлад да М. Дзямідава. У перыяд з 1934 па 1939 гг. ён рабіў паслугі паліцыі, інфармуючы пра настроі латвійскіх беларусаў. З архіўных крыніц вынікае, М. Дзямідаў перадаваў паліцыі таксама звесткі пра актыўнасць беларускіх цэнтраў за межамі Латвіі. Напрыклад, дзякуючы яму, латвійскай паліцыі было вядома пра дзейнасць Вячаслава Адамовіча "Дзергача", які жыў у Данцыгу і на пачатку 1930-х гг. звярнуўся да кіраўнікоў латвійскіх беларусаў з прапановай супрацоўніцтва. Непасрэдны кантакт М. Дзямідава з паліцыяй адбываўся праз іншага беларуса У. Корці, агента, які быў адказны за вярбоўку інфарматараў сярод нацменаў і кіраваў іх сеткай. Верагодна, што М. Дзямідаў быў завербаваны менавіта праз пасрэдніцтва У. Корці. Няма адпаведных крыніц, каб вызначыць, на якіх дакладна ўмовах працаваў М. Дзямідаў. Паводле сведчанняў У. Корці, М. Дзямідаў не належаў да штатных агентаў паліцыі, не атрымліваў штомесяц заробку, не меў таксама агентурнай мянушкі. Разам з тым, ён быў добра вядомы кіраўніцтву палітычнай паліцыі як інфарматар у беларускіх справах. Пазней М. Дзямідаў сведчыў, што не атрымліваў грошай за свае паслугі, а толькі часамі "пазычаў" у У. Корці пэўныя сумы, а таксама частаваўся за яго кошт віном у рэстаране[49].

Свае кантакты з палітычнай паліцыяй беларускі дзеяч выкарыстоўваў, каб мацаваць уласны ўплыў на беларускае настаўніцтва. Узамен за супрацоўніцтва кіраваная М. Дзямідавым арганізацыя магла разлічваць на палёгкі з боку ўлад. Напрыклад, У. Корці дапамог некаторым сябрам ТБНЛ атрымаць пасведчанні пра палітычную добранадзейнасць, што дазволіла ім працягваць педагагічную працу. Кіраўнік ТБНЛ паспяхова хадайнічаў перад У. Корці пра прыём на працу новых беларускіх настаўнікаў. Апрача таго, дзякуючы захадам М. Дзямідава, улады зацвердзілі новы статут Таварыства беларускіх настаўнікаў у Латвіі[50].

Кантакты М. Дзямідава з уладамі былі настолькі відавочныя, што напярэдадні II сусветнай вайны ён быў вядомы ў беларускім асяроддзі як лідар беларусаў, якія знаходзіліся на паслугах рэжыму Ульманіса. Яго ліслівасць да ўлад не падабалася большасці беларускіх дзеячаў. Некаторыя ставіліся да М. Дзямідава з насцярогай і пагардай, лічылі "правакатарам"[51]. Латвійская палітычная паліцыя ведала пра імідж М. Дзямідава, але супрацоўнічала з ім. Праўда, яна не мела да яго даверу, бо лічыла прыхільнікам левых поглядаў і аматарам прыгод. Магчыма, менавіта гэтыя якасці беларуса прыцягнулі

[49] LVA, 1986 f., 2 apr., P-10551, 88–97 lpp.

[50] LVA, 1986 f., 2 apr., P-10551, 88–97 lpp.

[51] AAN, MSZ, t. 5328, k. 37–45.

да М. Дзямідава ўвагу палітычнага ўпраўлення[52]. У паліцэйскай характарыстыцы (20 снежня 1935 г.) адзначалася, што ён з'яўляецца інжынерам на пенсіі, працаваў псаломшчыкам у праваслаўнай царкве Пакрова, захоўвае лаяльнасць да ўлады і апошнім часам не праяўляе палітычнай актыўнасці. Адзначалася, што да 1934 г. ён быў сябрам таварыства "Беларуская хата", але выйшаў з кіраўніцтва, калі кантроль над управай узялі прыхільнікі К. Езавітава. Аўтары запіскі падкрэслівалі, што М. Дзямідаў быў апанентам К. Езавітава і прыхільнікі апошняга лічылі яго правакатарам[53].

Найбольш пагаршэнне сітуацыі латвійскіх беларусаў пасля травеньскага пераварота адбілася на школах. Незадоўга да пераварота, 16 красавіка 1934 г., прайшло 50-е пасяджэнне Рады БША, на якім быў абраны новы склад на наступны навучальны год. Аднак працаваць новай Радзе ўжо не давялося: Беларускі школьны аддзел, як і адпаведныя аддзелы іншых нацыянальнасцей, у 1934 г. быў ліквідаваны. Замест яго была створаная пасада рэферэнта па справах беларускай асветы, на якую быў прызначаны Пятро Журкоўскі. У 1936 г., у сувязі са змяншэннем колькасці беларускіх школ, і гэта пасада была скасавана[54]. У выніку змен заканадаўства ў галіне асветы нацыянальных меншасцей павялічылася мінімальная колькасць вучняў, неабходная для стварэння школы: з 30 да 80. У выпадку, калі адзін з бацькоў належаў да латышскай нацыянальнасці, вучню забаранялася наведваць школу для нацменаў[55].

У першы год пасля травеньскага пераварота колькасць беларускіх пачатковых школ зменшылася з 23 (у 1933/34 навучальным годзе) да 16 (у 1934/1935 навучальным годзе), з якіх 5 працавалі ў Рызе і 11 – у Латгаліі. У 1934/35 гг. у беларускіх пачатковых школах навучалася 1 270 вучняў. Акрамя таго, па-ранейшаму дзейнічалі сярэднія школы – у Даўгаўпілсе і Рызе[56]. Да канца 1934 г. беларускія школы страціла ажно 52% вучняў[57]. У 1935/36 гг. беларускіх пачатковых і сярэдніх школ засталося толькі 6 (4 – на Даўгаўпішлчыне, 1 – у Даўгаўпілсе і 1 – у Рызе)[58]. У тым годзе была зачыненая апошняя беларуская пачатковая школа на Лудзеншчыне,

---

[52] LVVA, 3235 f., 5 apr., 1617 l., 11 lp.

[53] LVVA, 3235 f., 5 apr., 215 l., 2 lp.

[54] Э. Екабсонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [в:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 59.

[55] А. Чарняўскі, *Роля адукацыі ў культурна-асветніцкай дзейнасці беларускай нацыянальнай меншасці ў Латвіі (1918–1940 гг.)*, "Труды БГТУ. Серия: история, философия" 2023, № 1, с. 69.

[56] AAN, sygn.: MSZ, t. 5290, k. 25.

[57] A. Topij, *Polityka narodowościowa Łotwy w okresie rządów autorytarnych Kārlisa Ulmanisa (1934–1940)*, "Studia Historica Gedanensia" 2017, t. VIII, s. 267.

[58] AAN, sygn.: MSZ, t. 5290, Raport attaché Poselstwa RP w Rydze pt. Stan oświaty na Łotwie, 6 XI 1936 r.

а таксама большасць школ на Даўгаўпілшчыне. У 1936 г. спыніла існаванне беларуская пачатковая школа ў Даўгаўпілсе, а яе настаўнікі-беларусы былі вымушаны шукаць іншай працы. Апошнім аплотам беларускай школьнай справы ў Латгаліі заставаліся чатыры школы на Прыдруйшчыне і адна ў Даўгаўпілсе[59]. Разам са скарачэннем колькасці пачатковых школ ад года да года змяншалася лічба вучняў-беларусаў, якія атрымлівалі асвету на роднай мове. У 1933/1934 гг. беларускія школы наведвала 1 692 вучняў, у 1934/1935 гг. – 1 270, у 1935/1936 гг. – 956, у 1936/1937 гг. – 165. Колькасць вучняў беларускіх сярэдніх школ таксама скарачалася: у 1933/34 гг. іх было 196, у 1934/35 гг. – 154, у 1935/1936 гг. – 69, у 1936/1937 гг. – 50[60].

Частка беларускіх пачатковых школ была ператворана ў латышскія, іншыя былі зачыненыя або атрымалі статус мяшаных (*jauktas skolas*), якімі кіравалі настаўнікі-латышы. Можна прасачыць лёс некаторых школ. Напрыклад, Круманаўская школа (Пустынская воласць) была аб'яднаная з Аковіцкай польскай школай. Кокінская (Скайсценская воласць), Талаеўская (Прыдруйская воласць) і Дудэльская (Айлеўская воласць) школы былі ператвораны ў латышскія. Найменш пашанцавала Келаўскай школе, якая ўвогуле была расфарміраваная[61]. Беларускія школы ў Латгаліі, створаныя гадамі цяжкай працы мясцовых дзеячаў, былі ліквідаваныя. Вучні-беларусы перайшлі ў латышскія школы. У 1935/36 гг. гэтыя школы наведвала 4 517 беларусаў. Акрамя таго, у спецыяльных пачатковых школах вучыўся яшчэ 51 беларус. Праз чатыры гады ў латвійскіх школах налічвалася 3 680 вучняў-беларусаў, у тым ліку ў Рызе – 404, у Відзэмэ – 136, у Курляндыі – 77, у Земгаліі – 1 114 (1 009 – на Ілукшчыне), у Латгаліі – 1 949 (1 053 – на Даўгаўпілшчыне, 504 – на Лудзеншчыне, 234 – на Рэжыччыне, 157 – у Нова-Латгаліі)[62]. Нельга сказаць, што яны былі пазбаўленыя магчымасці вучыцца па-беларуску. Праграма змешаных школ прадугледжвала, што па жаданні бацькоў частка ўрокаў магла адбывацца на роднай мове. Аднак пасіўнае беларускае сялянства не заўсёды карысталася гэтай магчымасцю. Невыпадкова, выдаўцы *Беларускага календара* (гаворка пра яго будзе пазней) прасілі бацькоў-беларусаў парупіцца ў павятовых школьных інспектаратах пра рэгулярныя ўрокі роднай мовы ў былых беларускіх школах, ператвораных у змешаныя[63]. Аўтары выдання заклікалі суайчыннікаў

---

[59] Ш. І., *Наступ латыскага нацыяналізму на Беларусаў*, "Беларуская крыніца" № 2 ад 1 студзеня 1936 г., с. 1.

[60] AAN, MSZ, t. 10475, k. 178, 189.

[61] Lawon Burny, *Z biełaruskaha życcia ŭ Łatwii*, "Беларуская крыніца" № 38 ад 28 кастрычніка 1934 г., с. 1.

[62] *Latvijas statistikas gada grāmata 1939*, Rīga 1939, s. 38.

[63] *Беларускі календар. 1937 г.*, скл. С. Сахараў, Daugavpils 1936, с. 41, 44.

дбаць пра родную мову словамі: "*Калі б мы нашу родную, Богам нам дадзеную, беларускую мову закінулі, забыліся, тады па ўсіх нас іс лед загінуў бы на зямлі*"[64].

Павольная ліквідацыя беларускіх школ не была выняткавай з'явай у Латвіі. Пасля 1934 г. у іншых нацменаў (рускіх, палякаў) назіралася ідэнтычная тэндэнцыя. Ва ўмовах аўтарытарнага кіравання толькі літоўскай і эстонскай меншасцям удалося захаваць нацыянальныя школы, бо іх ахоўвалі латвійска-літоўская і латвійска-эстонская школьныя канвенцыі[65]. У параўнанні з іншымі нацыянальнымі групамі становішча беларусаў выглядала сярэднім. Беларусы мелі адну школу на 1 679 суайчыннікаў. Значна больш мелі латышы (адна школа на 100 чал.) і рускія (адна школа на 1 042 чал.), але менш эстонцы (адна школа на 1 753 чал.), літоўцы (адна школа на 2 083 чал.) і палякі (адна школа на 2 224 чал.). Але сітуацыя іншых нацменаў была лепшай, бо адсутнасць дзяржаўных школ яны маглі часткова кампенсаваць прыватнымі. Незаможная ж беларуская меншасць не магла разлічваць на такі варыянт. У 1934/35 гг. у Латвіі працавала толькі адна прыватная беларуская школа. Для параўнання, немцы мелі іх 42, габрэі – 19, рускія – 7, літоўцы – 1[66].

Хмары збіраліся над шматгадовым флагманам беларускай школьнай справы ў Латвіі – Даўгаўпілскай дзяржаўнай беларускай гімназіяй. У 1933/34 гг. яе наведала 78 вучняў, там працавала 14 настаўнікаў[67]. У наступным навучальным годзе ў II–V класах было 58 вучняў[68]. З прычыны таго, што гімназія знаходзілася ў стане ліквідацыі, некаторыя яе настаўнікі адначасова працавалі ў іншых навучальных установах: рускай гімназіі (Зэльма Фельдман, Тэкля Гаварс, Ян Катоўскі), Грыўскай беларускай пачатковай школе (а. Сава Трубіцын), Індраўскай беларускай пачатковай школе (Антон Лапацёнак), латышскай гімназіі ў Даўгаўпілсе (Эліза Бергман) і інш.[69] 14 кастрычніка 1934 г. адбыўся бацькоўскі сход гімназіі, на якім прысутнічаў

---

[64] *Беларускі календар. 1937 г.*, скл. С. Сахараў, Daugavpils 1936, с. 27.

[65] На працягу першых двух год кіравання К. Ульманіса руская меншасць страціла ажно 80 школ. Скарачэнне колькасць рускіх сярэдніх школ адлюстроўвае наступная статыстыка: у 1922/23 гг. іх было 34, а ў 1936/37 гг. толькі 3. У 1934/35 гг. былі ліквідаваныя ўсе польскія пачатковыя школы ў Ілукштанскім павеце: як прыватныя (5), так і дзяржаўныя (8). У гэтым жа годзе спыніла працу польская рамесніцкая школа ў Даўгаўпілсе. У наступныя гады працэс скарачэння колькасці польскіх школ працягваўся. AAN, MSZ, t. 10475, k. 102.

[66] AAN, MSZ, t. 10475, Szkolnictwo polskie na Łotwie, 1938, k. 15–17.

[67] LVVA, 2125 f., 5 ap., 33 l., 3 lp.; Э. Екабсонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [в:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 62.

[68] LVVA, 2067 f., 1 ap., 365 l., 414 lp.

[69] LVVA, 2067 f., 1 ap., 365 l., 329 lp.

новы дырэктар Яніс Плоніс (*Jānis Plonis*)[70]. Ён азнаёміў прысутных з новымі курсам дзяржаўнай школьнай палітыкі ў дачыненні да нацменаў[71]. Пасля гэтага адбыліся яшчэ чатыры пасяджэнні школьнай рады (23 і 29 лістапада, 19 лютага і 15 сакавіка 1935 г.)[72]. Рашэннем Рады міністраў ад 13 чэрвеня 1935 г. беларуская гімназія перастала існаваць. У верасні 1935 г. яна была аб'яднаная з польскай і рускай ды ўключаная ў II Даўгаўпілскую аб'яднаную агульнагарадскую гімназію, дзе існавалі рускі, польскі і беларускі камплекты. У 1935/36 гг. у трох класах беларускага камплекта налічвалася 30 вучняў[73]. Іх колькасць з цягам часу меншала. Увесну 1939 г. адбыўся апошні выпуск навучэнцаў, пасля чаго клас быў ліквідаваны[74].

Сум з нагоды закрыцця даўгаўпілскай гімназіі і іншых беларускіх школ перадаюць словы С. Сахарава, які яшчэ ў верасні 1936 г. пакінуў у дзённіку наступны запіс: "*У Дзвінску мне стала яшчэ сумней, чым у Краслаўцы. Усплываюць успаміны аб працы, жывой, дзейнай, у беларускай гімназіі. Зараз ідзеш міма гімназіі – не мігаюць вечарам агні ў майстэрнях, не чуваць стуку, не чуваць моладзі, не чуваць беларускай мовы. Усё разбурана, і невядома, для чаго... І як гэта латышы не падтрымоўваюць белар.[ускай] культ.[урнай] працы, не падтрымоўваюць невялікай часткі вялікага і блізкага ім па сумежнасці беларус.[кага] народа? Проста дзіву даешся. Чым мяшалі нашы белар.[арускія] школкі Латвійскай дзяржаўнасці? Раней кідаўся звычайна беларусам – ізбіты канёк: абвінавачанне ў камунізме. Зараз і гэта адпадае, бо не так ужо беларусы былі настроены камуністычна, як прадстаўляла сабе палітычная ахранка, гледзячы цераз акуляры ворагаў беларуск.[ай] нацыян.[альнай] меншасці ў Латвіі*"[75]. Тым часам, У. Пігулеўскі ў наступных словах апісваў сітуацыю: "*Аддзел зліквідаваны, зліквідавана і Дзвінская гімназія, зачынены ўсе пачатковыя школы за выключэннем адной рыжскай, пазачыніліся ўсе арганізацыі, параскіданы ўсе вучыцелі. Няма магчымасці сабрацца пагутарыць аб нашых справах. Людзі пазачыніліся ў шкарлупкі*"[76].

---

[70] Яніс Плоніс (1892–1950), каталіцкі святар. Скончыў Ковенскую духоўную семінарыю, служыў пробашчам у латгальскіх парафіях. Працаваў таксама ў сістэме асветы. У 1935 г. быў прызначаны дырэктарам 2-й Даўгаўпілскай аб'яднанай агульнагарадской гімназіі.

[71] LVVA, 2067 f., 1 ap., 378 l., 68 lp.

[72] Да апошняга моманту ў склад школьнай рады ўваходзілі настаўнікі: А. Якубецкі, У. Відаўскі, М. Фёдарава і Я. Краўзэ. LVVA, 2067 f., 1 ap., 378 l., 71–74 lpp.

[73] У той жа час ва ўсіх сярэдніх школах Латвіі навучаліся 74 беларусы. *Беларускі календар. 1937 г.*, скл. С. Сахараў, Daugavpils 1936, с. 41.

[74] Э. Екабсонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [в:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 62.

[75] *Крывіцкія руны. Вып. III: Беларускі культурны мацярык у Латвіі*, уклад., прадм., камент.: М. Казлоўскі, С. Панізьнік, Менск 2019, с. 125.

[76] Д. Крэнт, *Матэрыялы Цэнтра даследаванняў старадрукаваных кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі як крыніца па гісторыі*

Крыху інакш склаўся лёс беларускіх школ у Рызе. У адрозненні ад Латгаліі, у сталіцы беларускія школы не былі знішчаныя цалкам. Аднак і яны панеслі страты, бо дзяржава адмовілася даваць фінансавую дапамогу. Яскравым прыкладам была Рыжская беларуская прыватная гімназія ТБНЛ[77]. У 1933/34 гг. там працавалі: А. Родзька, К. Езавітаў, С. Сіцько, Р. Багаяўленскі, К. Мяжэцкі, Я. Кастылюк, А. Мірановіч, Юлій Брач, Франц Клагіш, Язэп Клагіш, Ніна Швангерадзэ, Адольфс Шліпс, Вікторыя Доўгая, а таксама тры настаўнікі-латышы[78]. У 1934/35 гг. педагагічны калектыў гімназіі быў наступны: С. Сіцько, Н. Швангерадзэ, В. Доўгая, Міхаіл Грыўскі, Адольф Шліпс, Марта Кельнэ, К. Мяжэцкі, Ф. Клагіш, Я, Кастылюк, П. Мірановіч, В. Лейтэн-Рудзіт, М. Дзямідаў (сакратар педрады ў 1934/35 гг.)[79]. 25 траўня 1934 г. педрада гімназіі "па прычыне хворасці" адхіліла ад працы экзаменацыйнай камісіі па беларускай мове К. Езавітава (яго замянілі Ф. Клагіш і С. Сіцько)[80]. 6 чэрвеня 1934 г. К. Езавітаў быў звольнены з гімназіі згодна з распараджэннем міністра асветы. На яго пасаду сакратара школьнай рады 15 чэрвеня 1934 г. быў прызначаны Я. Клагіш[81]. У ліпені 1934 г. у гімназію настаўнікам беларускай мовы зноў быў прыняты М. Дзямідаў, што належыць тлумачыць прыхільным стаўленнем да яго з боку латвійскіх улад[82]. 12 кастрычніка 1934 г. адбылося чарговае звальненне: загадам міністра асветы А. Родзька быў пазбаўлены пасады дырэктара гімназіі, яго абавязкі пераняў П. Мірановіч[83]. Адначасова двум настаўнікам, Францу і Язэпу Клагішам, міністэрства адмовілася працягнуць працоўны кантракт[84].

У верасні 1934 г. Рыжскае гарадское самакіраванне прыняло рашэнне з 1 студзеня 1935 г. спыніць грашовую дапамогу Рыжскай беларускай прыватнай гімназіі. У сувязі з гэтым не мог адбыцца набор новых вучняў у I клас, што стала пачаткам канца школы. У снежні 1934 г. кіраўніцтва ТБНЛ абвясціла, што з гэтага часу ўсе настаўнікі гімназіі лічацца вызваленымі ад прафесійных абавязкаў. Разам з тым, кіраўніцтва ТБНЛ не пакідала

беларускага нацыянальна-культурнага жыцця ў Латвіі ў 1920–1930-ыя гг., "Латыши и беларусы: вместе сквозь века" 2023, № 12, с. 121.

[77] Не адпавядаюць рэчаіснасці паведамленні заходнебеларускай прэсы пра тое, што гімназія спыніла працу на пачатку 1933/34 гг. *З беларускага жыцьця ў Латвіі*, "Беларуская крыніца", № 35 ад 26 верасня 1933 г., с. 3.

[78] LVVA, 3175 f., 1 ap., 7 l., 94 lp.

[79] LVVA, 3175 f., 1 apr., 8 l., 63 lp.

[80] LVVA, 3175 f., 1 apr., 8 l., 61 lp.

[81] LVVA, 3175 f., 1 apr., 4 l., 20 lp.

[82] LVVA, 3175 f., 1 ap., 1 l., 34 lp.

[83] LVVA, 3175 f., 1 apr., 8 l., 73 lp.

[84] Lawon Burny, *Z biełaruskaha życcia ŭ Łatwii*, "Беларуская крыніца" № 38 ад 28 кастрычніка 1934 г., с. 1.

надзеі на далейшую працу школы, было вырашана апытаць педагогаў, каб высветліць, хто з іх можа працаваць бясплатна да канца 1934/35 гг. Адначасова таварыства шукала выйсця з складанай матэрыяльнай сітуацыі[85]. 20 лістапада 1934 г. у гімназіі налічвалася 55 вучняў, у тым ліку: у II класе – 13, у III – 10, у IV – 7, у V – 25[86]. У 1936 г. гімназія, а таксама яшчэ дзве беларускія школы ў Рызе (2-я пачатковая і вячэрняя) былі зачынены[87].

Пасля таго ў латвійскай сталіцы працавала толькі 1-я Рыжская беларуская пачатковая школа (кіраўнік С. Сіцько), якая заставалася адзінай беларускай школай у Латвіі ў 1936–1940 гг. У 1938/39 гг. у ёй працавалі 12 настаўнікаў, якія вучылі 157 вучняў. Восенню 1939 г. рыжская гарадская школьная ўправа разглядала магчымасць ліквідацыі дашкольнага класа. Кіраўніцтва ТБНЛ на пасяджэнні 1 кастрычніка 1939 г. склала зварот да міністра асветы з просьбай устрымацца ад такога кроку. З міністрам сустрэлася беларуская дэлегацыя, пасля чаго ўлады адмовіліся ад ранейшых планаў[88].

У працэсе ліквідацыі беларускіх школ педагогі старэйшага веку былі адпраўленыя на пенсію, а малодшыя – пераведзеныя ў змешаныя школы ці звольненыя. Некаторыя настаўнікі знайшлі часовую працу ў польскіх і рускіх школах. Супрацоўнікі польскага пасольства ў Рызе адзначалі, што прынамсі частка беларускага настаўніцтва адчувала варожасць да дзяржавы, страціўшы працу ў роднай школе. Польскі дыпламат пісаў: "*Як выхадцы з вёскі яны* [беларускія настаўнікі – ЕГ] *захавалі ў сэрцы нянавісць да кіравання Ульманіса, якое пазбавіла іх кавалка хлеба*"[89]. Люцыя Габран, былая настаўніца беларускай школы і жонка настаўніка Канстанціна Александровіча, пасля звальнення мужа пакінула ў дзённіку запіс: "*Косцік вельмі засмучаны такім зваротам, але нічога не зробім. Ён не ведае латышскай мовы, і такім людзям не жадаюць даваць размяшчэнне ў латвійскай дзяржаве. Адна за адной зачыняюцца беларускія, польскія і рускія школы. Замест іх ствараюць латышскія школы, і ім патрэбны настаўнікі, якія на 100% з'яўляюцца латышамі. Нават тых, хто ведае латышскую, адпраўляюць на пенсію, бо 'сэрца не латышскае'*"[90].

---

[85] LVVA, 3175 f., 1 ap., 7 l., 16 lp.

[86] LVVA, 3175 f., 1 ap., 7 l., 84 lp.

[87] Захаваліся звесткі пра педагагічны склад 2-й Рыжскай беларускай пачатковай школы ў два апошнія гады існавання (1934–1936 гг.). У гэты час у школе працавалі настаўнікі: М. Слосман, Г. Нікіфароўская, П. Мірановіч, Паўльс Азоліньш, Эмілія Казакевіч, Казімір Мяжэцкі, Мая Локс, Ян Кудраўцоў, П. Юр'еўскі, С. Сіцько, Р. Плыгаўка, Надзея Юзафовіч, а. Мікалай Македонскі, Бірута Брэдэрман, Таісія Мікула. НАРБ. ф. 458, воп. 1, спр. 127, л. 1–37.

[88] LVVA, 2924 f., 1apr., 6 l., 17–18 lpp.

[89] AAN, sygn. 477, t. 5328, Raport Poselstwa RP w Rydze, Raport dot. działalności białoruskiej na Łotwie, 12 lutego 1939 r.

[90] K. Kunicka, *A Pole who contributed to Belarusian education and cultural life in Latvia: the peculiar case of Konstanty Aleksandrowicz* [in:] *In the Shadow of Others. Belarusian-Latvian Relations from the past to Nowadays*, Prague 2022, p. 385.

У сувязі з закрыццём беларускіх школ, знікла патрэба ў падрыхтоўцы педагагічных кадраў. Яшчэ ў 1934 г. быў спынены набор слухачоў на Рыжскія дзяржаўныя беларускія настаўніцкія курсы, а іх кіраўнік П. Жэрдзі звольнены"за левы ўхіл"[91]. У 1935 г. курсы спынілі існаванне. У апошні год там працавалі наступныя лектары: У. Пігулеўскі, А. Родзька, С. Сіцько, С. Сахараў, Я. Кастылюк, М. Дзямідаў, П. Мірановіч, Т. Шміт, К. Арэ, А. Азоліньш, П. Петэрыс, М. Паўлава і М. Грыўскі[92]. Разам з тым, улады ў Рызе разумелі, што за кароткі час цалкам перабудаваць асвету нацменаў на новы лад немагчыма. Таму ў другой палове 1930-х гг. пры Рыжскім педагагічным інстытуце былі адчыненыя аддзелы для прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей. Нелатышы, у тым ліку беларусы, па-ранейшаму мелі (хоць невялікую) магчымасць атрымаць педагагічную падрыхтоўку на роднай мове[93].

Асіміляцыйная палітыка ўрада Ульманіса была скіравана супраць усіх нелатышоў, але беларусы апынуліся ў найгоршым становішчы. Рускія і габрэі былі заможнейшыя і таму маглі больш паспяхова супрацьстаяць наступу ўлад. Літоўцы, эстонцы, немцы і палякі маглі разлічваць на падтрымку сваіх дзяржаў-метраполій, пад ціскам якіх латвійскія ўлады былі вымушаны змякчаць асіміляцыйныя захады. Яскравым прыкладам была сітуацыя польскай меншасці. Узяўшы пад увагу неабходнасць падтрымання добрасуседскіх адносін з Польшчай, улады ў Рызе мусілі лічыцца з правамі мясцовых палякаў. Патаемныя польска-латвійскія перамовы 1936 г. скончыліся згодай Латвіі на ўзнаўленне дзейнасць некаторых польскіх арганізацый. Тым часам, латвійскія беларусы маглі разлічваць выключна на ўласныя сілы і ласку латвійскай дзяржавы. У верасні 1935 г. дэлегацыя прадстаўнікоў беларускай меншасці падрыхтавала мемарыял на імя К. Ульманіса. Яго аўтары намагаліся "*выправіць і змяніць на лепшае той негатыўны погляд на беларускую меншасць, які ў некалькі апошніх год з лёгкай рукі некаторых безадказных палітыкаў пачаў складацца і ўмацоўвацца ў латвійскім грамадстве, а таксама і ў некаторых колах латвійскага чыноўніцтва*"[94].

Беларусы падкрэслівалі лаяльнасць да латвійскай дзяржаўнасці, нагадваючы, што заўсёды прыхільна ставіліся да латышскага нацыянальна-адраджэнскага руху. У мемарандуме згадвалася пра імкненне БНР знайсці

---

[91] Lawon Burny, *Z biełaruskaha życcia ŭ Łatwii*, "Беларуская крыніца" № 38 ад 28 кастрычніка 1934 г., с. 1.

[92] К. Езавітаў, *Беларускія школы ў Латвіі ў 1933–34 навуч. годзе*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1934, № 7(24), с. 362.

[93] С. Цоя, *К истории русского образования в межвоенной Латвии (20–30-е годы XX в.)* [в:] *Альманах. Вып. XXXVI. Русский мир и Латвия: смена времен*, ред. С.А. Мазур, Рига 2014, с. 79–98.

[94] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 102, л. 2.

хаўруснікаў у Латвіі ў 1918–1919 гг. Аўтары акцэнтавалі ўвагу на ўдзеле беларусаў у змаганні за незалежнасць балтыйскіх краін. У дакуменце чытаем: "*У 1920 годзе, калі межы Латвіі былі канчаткова азначаны і высветлілася, што ў склад Латвійскае Рэспублікі ўвойдзе цэлы шэраг валасцей з пераважным беларускім жыхарствам, ні Рада Беларускай Народнай Рэспублікі, ні Беларускі Урад, ні грамадскія беларускія арганізацыі не выказалі з гэтага повaду свайго незадавальнення, бо былі пэўныя, што латышы, якія гераічна змагаліся за сваё нацыянальнае адраджэнне, будуць шанаваць правы беларускае нацыянальнае меншасці ў Латвіі і ніколі не стануць на шлях уціску і дэнацыяналізацыі беларусаў, як гэта рабілі раней расейцы і палякі*"[95]. Далей даваўся кароткі агляд становішча латвійскіх беларусаў, іх арганізацыйнай і асветнай дзейнасці. Аўтары петыцыі адзначалі, што галоўнымі ворагамі беларускай справы ў Латвіі былі рускія і палякі, адвечныя асімілятары беларусаў Латгаліі, якія пашыралі чуткі пра антыдзяржаўныя памкненні латвійскіх беларусаў. На завяршэнне аўтары выказвалі надзею, што латвійскія ўлады прыхільна паставяцца да нацыянальна-культурных патрэб беларусаў[96].

Аднак захады беларускага актыву не былі ў стане сур'ёзна паўплываць на нацыянальную палітыку латвійскага ўраду, скіраваную на ўзмацненне асіміляцыі нацменаў. Ва ўрадавых колах набывала практычнае значэнне думка, што латгальскія беларусы (як і палякі) з'яўляюцца латышамі, таму зараз належыць праз школу "вярнуць" іх ва ўлонне латышскага народа. Латвійская прэса ўхваляла дзяржаўную палітыку пераводу школ нацменаў у Агульны школьны дэпартамент. У новай палітычнай рэальнасці ўсё мацней гучалі галасы прадстаўнікоў латышскай інтэлектуальнай эліты, якія трымаліся радыкальных поглядаў на "беларускае пытанне" ў Латвіі. У 1938 г. пабачыла свет праца Вілбертса Краснайса (*Vilberts Krasnajs*) пад назвай *Baltkrievi kā latviešu tautas zars* (*Беларусы як адгалінаванне латышскага народа*)[97].

У перыяд кіравання Ульманіса беларусы Латвіі не маглі разлічваць на падтрымку БССР, дзе ў той час пад выглядам "барацьбы з нацдэмамі" набіралі моц сталінскія рэпрэсіі супраць нацыянальнай інтэлігенцыі. Перыяд "чырвонай" беларусізацыі беззваротна застаўся ў мінулым. На змены ў жыцці суайчыннікаў у Латвіі звярталі ўвагу заходнебеларускія выданні. Напрыклад, "Родны край" размесціў інфармацыю пра закрыццё беларускай

---

[95] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 102, л. 5.

[96] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 102, л. 1–10.

[97] М. Голдманис, *'Белорусский' дискурс в латышской прессе (1920–1934): эволюция представления о беларусах как о самостоятельном национальном меньшинстве*, "Латыши и беларусы: вместе сквозь века", Минск 2016, № 5, с. 72.

гімназіі ў Даўгаўпілсе[98]. Аўтар артыкула ў "Беларускай крыніцы" адзначаў, што наступ латышскага нацыяналізму выклікаў заняпад нацыянальнай актыўнасці тамтэйшых беларусаў[99]: "*Беларусы ў Заходняй Беларусі (...) нямала цешыліся з беларускага жыцця ў Латвіі. Цешыліся ў асобнасці мы – БХД і яе прыхільнікі. Але ад 15.V.34 г. беларуская радасць пераходзіць у сум. Ад гэтай даты 'Б. Крыніца' ўсцяж рэструе факты ліквідацыі беларускага жыцця ў Латвіі. Латышскія нацыяналісты, дайшоўшыя ў гэты дзень да ўлады шляхам пераваротy, надаюць свой нацыяналістычны тон усяму жыццю ў дзяржаве. І ад гэтага 'тону' – найбольш пацярпелі беларусы. Беларускае палітычнае жыццё ў Латвіі афіцыйна ўжо зліквідавана, беларускае грамадска-эканамічнае і культурна-асветнае жыццё ўжо часткова зліквідавана і знаходзіцца далей у стадыі ліквідацыі (...) Латышскі нацыяналізм спужаўся беларушчыны і аб'явіў проціў яе паход. Спужаўся працэсу ўзросту беларушчыны над Латвіяй. Сярод беларускага працоўнага сялянства, якое дзеля тых ці іншых прычын запісвалася 'латышамі', – знаходзяцца адзінкі вельмі свядомыя і моцныя беларускім духам. Яны з'яўляюцца ў некаторай меры кіруючымі дзейнікамі беларускага жыцця пад Латвіяй, і працуюць там пазітыўна. Ясная рэч, выключацца тут беларускія элементы ўгадовыя (дзе іх няма!), якія, з'яўляючыся служкамі латышскага нацыяналізму, за срэбранікі праводзяць сваю подлую работу*"[100]. Крытыкуючы нацыянальную палітыку латвійскай улады, віленскія аўтары, аднак, звярталі ўвагу на тое, што сітуацыя латвійскіх беларусаў і так была значна лепшая, чым у іх суайчыннікаў з Заходняй Беларусі[101].

На думку прадстаўнікоў польскага дыпламатычнага корпусу ў Латвіі, адміністрацыйны ціск на нацменаў спрыяў росту камуністычнай актыўнасці. У студзені 1936 г. польскае пасольства ў Рызе інфармавала пра выпадкі камуністычнай агітацыі на польскай мове сярод жыхароў Ілукшчыны. Пры гэтым адзначалася, што агітацыя трапляла на прыдатны грунт, бо палітыка Рыгі ў дачыненні да нацменаў выклікае нянавісць мясцовага насельніцтва[102]. Няма адпаведных крыніц не дазваляе вызначыць, ці існавала сувязь паміж дзеяннямі ўлады ў галіне нацыянальна-культурнай аўтаноміі і прасавецкімі настроямі беларускага насельніцтва. Ведаючы тагачасныя рэаліі, можна меркаваць, што беларускае сялянства Латгаліі рэагавала

---

[98] *Беларуская справа ў Латвіі*, "Родны край" № 16 ад 28 чэрвеня 1935 г., с. 1.

[99] AAN, sygn.: MSW, t. 963, k. 176, Sprawozdanie życia mniejszości narodowych za I kwartał 1936 r.

[100] Ш. І., *Наступ латыскага нацыяналізму на Беларусаў*, "Беларуская крыніца" № 2 ад 1 студзеня 1936 г., с. 1.

[101] R.M., *Z školnaha i haspadarčaha žyćcia ŭ Łatwii*, "Беларуская крыніца" № 31 ад 25 жніўня 1934 г., с. 2.

[102] AAN, MSZ, t. 6193, k. 10.

на сацыяльна-эканамічныя змены, а не на пагаршэнне нацыянальна-культурнага статусу.

У ажыццяўленні палітыкі асіміляцыі ўдзельнічалі некаторыя былыя выхаванцы беларускіх школ і настаўніцкіх курсаў (напрыклад, Антон Лейтан і Ганна Жукава-Лейтан). Варта зноў даць слова С. Сахараву, які ў жніўні 1939 г. занатаваў у дзённіку: "*Летам я крыху паездзіў па Латгаліі (з 20 ліпеня па 4 жніўня) і быў паміж іншым у [Шкавенскай] вол.[асці] [Шушково] і Шешково), дзе запісаў 270 беларускіх песень. Куток гэты чыста беларускі, але зараз яго латышызуюць, і хто ж гэта праводзіць: самі ж беларусы на чале, ныне Saulekail-скай школы... скончыўшы Лудзенскую беларуск.[ую] школу нейкі Лейтан, які ўвесь час прызнаваў сябе беларусам, а зараз лічыць сябе латышом; жонка яго – скончыўшая Дзвінскую белар.[ускую] гімназію Ганна Жукава сумесна з ім вучыцельствуе; дзеці іх ужо запісаны латышамі*"[103].

Падсумоўваючы, можна зрабіць выснову, што беларускае нацыянальна-культурнае і арганізацыйнае жыццё ў Латвіі ў другой палове 1930-х гг. апынулася ў стане крызісу і стагнацыі. Лідары латвійскіх беларусаў бачылі сітуацыю ў надзвычай змрочных колерах. Пазней К. Езавітаў пісаў, што беларусы страцілі родныя школы і магчымасць весці выдавецкую дзейнасць, а падручнікі для беларускіх школ былі "па-варварску спалены". Беларускі дзеяч адзначаў, што мясцовая інтэлігенцыя страціла працу, сяляне пад невыносным ціскам паліцэйскага рэжыму ўцякалі з памежных раёнаў, а іх месца займалі латышы, беларускіх дзяцей заваблівалі ў латышскія школы, і там забаранялі размаўляць па-беларуску – прычым як у школьных мурах, так і па-за імі[104].

На самай справе рэчаіснасць не выглядала аж так, як яе маляваў К. Езавітаў. Нават ва ўмовах аўтарытарызму латвійскія беларусы не страцілі ўсіх магчымасцей нацыянальна-культурнай працы. Галоўным асяродкам беларускага жыцця ў той час стала Рыга, бо нацыянальна-культурная актыўнасць у правінцыі цалкам замерла. Улады рупіліся, каб латвійскія нацыянальныя ўплывы не мелі канкурэнцыі ў нацыянальна-мяшанай Латгаліі. Таму менавіта там арганізацыйная дзейнасць нацменаў была ліквідаваная. Тым часам да праяў актыўнасці нелатышоў са значна меншай насцярогай ставіліся ў Рызе – касмапалітычнай сталіцы, дзе нацыянальная інтэлігенцыя была адарваная ад сялянскіх мас. Сталіца была адзіным месцам, дзе беларуская нацыянальна-культурная праца захавала арганізацыйныя формы. Яна адбывалася на базе 1-й Рыжскай беларускай пачатковай школы і Таварыства беларускіх настаўнікаў у Латвіі. У школьных

---

[103] *Крывіцкія руны. Вып. III: Беларускі культурны мацярык у Латвіі*, уклад., прадм., камент.: М. Казлоўскі, С. Панізьнік, Менск 2019, с. 131.

[104] К. Езавітаў, *Беларусы ў Латвіі*, "Раніца" 1941, 10 лістапада, с. 2.

мурах ладзіліся культурныя імпрэзы, тэатральныя выступы і публічныя лекцыі на педагагічныя тэмы для сяброў ТБНЛ. Нягледзячы на праўладную пазіцыю і поўны кантроль з боку палітычнай паліцыі, Таварыства беларускіх настаўнікаў у Латвіі ў разгляданы час было адзіным месцам, якое аб'ядноўвала дзейную частку беларускага нацыянальнага актыву. У лістападзе 1938 г. арганізацыя налічвала 71 сябра, большасць з якіх (54 чал.) складалі настаўнікі і іх сям'і, а рэшту – рабочыя і службоўцы. Да актыву арганізацыі належалі: М. Дзямідаў, М. Краўчанка, Я. Клагіш, Я. Кастылюк, Н. Пінская, Г. Нікіфароўская, Сцяпан Рамаш, Ілля Фёдараў, А. Якубецкі, А. Якубецкая, Васіль Нікіфароўскі, Марыя Каспяровіч, Алесь Сальцэвіч, М. Талерка, Пятро Журкоўскі, Серафім Дынабургскі, Матыльда Лечман, Кастусь Нікіфароўскі, П. Мірановіч, Эмануіл Сангайла-Станевіч, С. Казека, С. Сахараў і інш. У склад управы арганізацыі ўваходзілі: М. Дзямідаў (старшыня), Анастасія Крэйц (сакратар), М. Краўчанка, Н. Касневіч, П. Мірановіч і Сцяпан Рамаш. Праўда, некаторыя сябры не праяўлялі актыўнасці і нават не ўдзельнічалі ў пасяджэннях управы. У 1938–1939 гг. адбылося 35 пасяджэнняў кіраўніцтва і два сходы сяброў ТБНЛ[105].

Арганізацыя ўтрымлівалася з сяброўскіх складак, памер якіх быў для настаўнікаў 1% заробку і 0,4% – для прадстаўнікоў іншых прафесій. Таксама прыбытак давала выручка з вечарын і ахвяраванні. Кіраўніцтва арганізацыі здолела атрымаць сродкі стыпендыйнага фонду колішняга Беларускага школьнага аддзела. 24 жніўня 1938 г. управа ТБНЛ пастанавіла запрасіць на пасяджэнне былога кіраўніка БША У. Пігулеўскага і запатрабаваць ад яго справаздачу пра стан фонду[106]. 5 кастрычніка 1938 г. управа вырашыла звярнуцца ў Міністэрства асветы з просьбай перадаць ТБНЛ сродкі са стыпендыйнага фонду былога БША[107]. У выніку сродкі фонду (1 069 латаў) былі пералічаны на рахунак ТБНЛ[108]. Выдаткі на дзейнасць арганізацыі былі значныя. Таварыства на мела нерухомасці, таму мусіла плаціць за арэнду сядзібы 10 латаў штомесяц. Рухомая маёмасць арганізацыі ацэньвалася ў 800 латаў (300 – кошт бібліятэкі, 500 – абсталяванне сядзібы)[109].

Восенню 1938 г. М. Дзямідаў вырашыў актывізаваць працу ТБНЛ. На пасяджэнні ўправы 24 жніўня 1938 г. было вырашана правесці (да 1 кастрычніка) перарэгістрацыю сяброў арганізацыі. Удзельнікі ўхвалілі прапанову стварыць пры таварыстве Жаночы камітэт на чале з Анастасіяй Крэйц, а таксама актывізаваць працу бібліятэкі (пад кіраўніцтвам Н. Касневіча),

[105] LVVA, 3235 f., 5 apr., 1617 l., 15 lp.
[106] LVVA, 2924 f., apr. 1, 2 l., 1 lp.
[107] LVVA, 2924 f., apr. 1, 2 lieta, lp. 13.
[108] LVVA, 3235 f., 5 apr., 1619 l., 9 lp.
[109] LVVA, 3235 f., 5 apr., 1617 l., 15 lp.

якая працавала ў серады. Было таксама вырашана пачаць цыкл лекцый па грамадазнаўстве і беларусазнаўстве, запрасіць лектараў[110]. 7 верасня 1938 г. кіраўніцтва таварыства разгледзела заявы былых вучняў беларускай гімназіі (15 чал.), якія звярнуліся з просьбай дапамагчы ім падрыхтавацца да іспытаў на атэстат пра сярэднюю адукацыю. У выніку ўправа ТБНЛ вырашыла зладзіць платныя курсы латышскай мовы і курсы па ўсіх прадметах сярэдняй школы. З гэтай мэтай былі падрыхтаваны адпаведныя звароты да ўлады і беларускай грамадскасці[111]. У якасці лектараў былі запрошаныя А. Родзька (матэматыка і фізіка) і Я. Юзафовіч (электратэхніка)[112]. 15 верасня 1938 г. управа ТБНЛ звярнулася да міністра асветы з просьбай дазволіць стварэнне дадатковай беларускай школы ў Рызе, але не атрымала згоды[113]. Таварыства спрабавала актывізаваць працу і ў правінцыі. У верасні 1938 г. кіраўнік ТБНЛ наведаў аддзелы ў Даўгаўпілсе (кіраўнік А. Барткевіч) і Лудзы (кіраўнік С. Казека). У выніку паездкі высветлілася, што Даўгаўпілскі аддзел цягам чатырох гадоў не праяўляў ніякай актыўнасці, а Лудзенскі быў ліквідаваны яшчэ ў 1935 г.[114]

Заслугоўвае ўвагі ўдзел таварыства ва ўшанаванні памяці вайскоўцаў-беларусаў. 16 кастрычніка 1938 г. старшыня ТБНЛ удзельнічаў у Ілукштанскім павеце ва ўшанаванні памяці 15-ці жаўнераў беларускага асобнага батальёна літоўскага войска, якія палеглі падчас баёў з Чырвонай арміяй. Пазней таварыства працягвала традыцыю ўшанавання беларускіх вайскоўцаў на Ілукшчыне[115]. На пасяджэнні ўправы арганізацыі (19 кастрычніка 1938 г.) было прынята рашэнне ўзяць удзел у святкаванні 20-годдзя незалежнасці Латвіі: зладзілі цыкл лекцый, які пачаўся выступам М. Дзямідава *Гістарычнае мінулае і сучаснае становішча заходніх, прыбалтыйскіх і ўсходніх славян*. Таварыства трымала сувязь з суродзічамі ў Літве. У кастрычніку 1938 г. управа ТБНЛ падтрымала грашыма ініцыятыву літоўскіх беларусаў выдаць беларускі каляндар на 1939 год. З просьбай пра мастацкае афармленне выдання было вырашана звярнуцца да К. Дуж-Душэўскага[116].

Аналіз захаваных крыніц дазваляе меркаваць, што таварыства не ствараля клопатаў уладам. У снежні 1938 г. Міністэрства асветы паінфармавала кіраўніцтва ТБНЛ пра вылучэнне арганізацыі двух месцаў у складзе Латвійскай прафесійнай палаты. На пасяджэнні 7 снежня 1938 г. управа

---

[110] LVVA, 2924 f., 1 apr., 2 l., 1 lp.

[111] LVVA, 2924 f., 1 apr., 2 l., 3–4 lpp.

[112] LVVA, 2924 f., 1 apr., 2 l., lp. 13.

[113] LVVA, 2924 f., 1 apr., 2 l., lp. 5.

[114] LVVA, 2924 f., 1 apr., 2 l., lp. 10.

[115] У лютым 1939 г. сябры ТБНЛ набылі вянок на магілу беларускіх жаўнераў у Чырвонках. LVVA, 2924 f., apr. 1, 3 l., 1 lp.

[116] LVVA, 2924 f., 1 apr., 2 l., 14, 23 lpp.

таварыства расцанілі крок уладаў як прызнанне за беларусамі належных правоў нароўні з прадстаўнікамі іншых меншасцей. У склад камеры былі дэлегаваны старшыня М. Дзямідаў і настаўнік 1-й Рыжскай беларускай пачатковай школы П. Мірановіч[117]. Адным з апошніх мерапрыемстваў ТБНЛ была арганізацыя вечарыны ў траўні 1939 г. у сядзібе Рыжскага латышскага таварыства. Падчас мерапрыемства гісторык Юлій Брач прачытаў рэферат пра латышска-беларускія адносіны, а драматычны гурток пад кіраўніцтвам Ф. Дамброўскага-Думбрайса паставіў п'есу Я. Купалы *Паўлінка*[118].

Кажучы аб праявах нацыянальна-культурнай актыўнасці латвійскіх беларусаў у разгляданы перыяд, неабходна адзначыць, што некаторыя дзеячы засяродзіліся на творчай працы. У гэты час плённа працаваў С. Сахараў. Напрыканцы 1936 г. яго намаганнямі быў падрыхтаваны беларускі каляндар на 1937 год. Выданне складалася не толькі і з пераліку юбілейных датаў і рэлігійных святаў, але і з інфармацыйных звестак. Асобны раздзел быў прысвечаны Латвіі, яе насельніцтву, эканоміцы і культуры. Выданне мела сельскагаспадарчы раздзел з парадамі для сялян. Адзін з раздзелаў тычыўся жыцця беларусаў у Літве, Польшчы, БССР. У дзіцячым кутку былі казкі, вершы, прыказкі і гульні[119]. Укладальнік знайшоў месца таксама для беларускіх народных прыкмет, датычных клімату і надвор'я, звестак аб астранамічных з'явах і народнай творчасці латгальскіх беларусаў. Аўтары выдання выкарысталі абодва беларускія алфавіты – кірыліцу для праваслаўных беларусаў, лацінку – для каталікоў[120]. Патрэбу выдання календара С. Сахараў тлумачыў наступным чынам: "*У сучасны момант у нас, Латвійскіх беларусаў, дзякуючы недахопу сродкаў, няма ні сваёй газеты, ні сваёй часопісі. А як прыемна ў сваёй роднай мове прачытаць ці газету, ці кніжку, гэта добра ведае кожны чалавек, к якой бы ён нацыянальнасці не належаў. Вось чаму мы выпускаем для беларускага грамадзянства Латвіі гэты невялічкі 'Беларускі каляндар' на 1937 г., спадзеючыся, што кожны свядомы беларус спаткае яго прыхільна і дображадана. У календары мы пастараліся сабраць усё тое, што карысна для беларусаў, жывучых у Латвіі. Наша жаданне, каб такі каляндар штогодна выдаваўся ў Латвіі, каб ён служыў моцнаю сувяззю паміж нашай дзяржавай і беларусамі і каб ён быў добрым падарожнікам і радчыкам у нашым жыцці, абуджаючы і падтрымоўваючы нашу*

---

[117] LVVA, 2924 f., apr. 1, 2 l., 33 lp.

[118] БДАМЛіМ, Ф. 3, воп. 1, спр. 48, л. 30; LVVA, 2924 f., 1 apr., 3 l., 13 lp.

[119] М. Ліс, *Літаратурна-публіцыстычная дзейнасць С.П. Сахарава* [у:] *Інфармацыйнае забеспячэнне навукі: праблемы, пошукі, рашэнні. Зборнік навуковых артыкулаў*, Менск 2000, с. 131.

[120] А. Чарняўскі, *Выдавецкая дзейнасць беларускай нацыянальнай меншасці ў міжваеннай Латвіі (1918–1940 гг.)*, "Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Серыя 1. Гісторыя і археалогія. Філасофія. Паліталогія" 2023, т. 15, № 3, с. 65.

грамадзянскую і нацыянальную свядомасць. Таму абавязак кожнага беларуса самому прачытаць свой каляндар і пашыраць яго паміж сваімі суседзямі-беларусамі"[121]. Апрача календара, у 1935–1939 гг. С. Сахараў выдаў шэраг навуковых і навукова-публіцыстычных прац па гісторыі Латгаліі[122].

Ва ўмовах аўтарытарнага кіравання беларускія актывісты не маглі займацца палітычнай дзейнасцю. Дзеячы, якія ў перыяд парламентарызму ангажаваліся ў палітыку (К. Езавітаў, У. Пігулеўскі, С. Сахараў), апынуліся на ўзбочыне грамадскага жыцця. Перадусім гэта тычылася К. Езавітава, які праз левыя погляды быў пад пільнай увагай палітычнай паліцыі. Пазбаўлены магчымасці займацца педагагічнай і грамадскай працай, ён быў вымушаны пакінуць Рыгу, каб забяспечыць сябе матэрыяльна. 1 кастрычніка 1934 г. беларускі дзеяч выехаў у Ліепайскі раён, дзе заняўся будовай рыбных ставоў і гадоўляй карпаў[123]. Але і адтуль К. Езавітаў працягваў трымаць карэспандэнцыйную сувязь з віленскімі і пражскімі беларускімі дзеячамі. Жывучы на Ліепайшчыне, ён часамі наведваў Рыгу, цікавіўся жыццём сталічнага беларускага актыву[124].

Ёсць падставы меркаваць, што іншы беларускі дзеяч, У. Пігулеўскі, трымаў сувязь з былымі аднапартыйцамі. У прыватнасці польскае пасольства ў Рызе інфармавала, што ў траўні 1938 г. ён сустрэўся з групай латвійскіх сацыял-дэмакратаў на чале з былымі дэпутатамі Сойма Паўлісам Лейніньшам (*Pauls Lejiņš*) і Клявсам Лорэнцам (*Klāvs Lorencs*), каб даведацца, як яны ставяцца да яго асобы і яго ролі як прадстаўніка беларускіх інтарэсаў[125]. Палітычная паліцыя сачыла таксама за С. Сахаравым. У прыватнасці, яна інфармавала, што ў жніўні 1938 г. ён наведаў памежныя раёны Латгаліі, сустрэўся з былымі выхаванцамі Даўгаўпілскай беларускай гімназіі, якія адмоўна ставяцца да ўлады, і абмеркаваў з імі магчымасць аднаўлення беларускай дзейнасці[126].

---

[121] *Беларускі календар. 1937 г.*, скл. С. Сахараў, Daugavpils 1936, с. 7.

[122] Належыць узгадаць наступныя працы С. Сахарава: *Город Лудза в прошлом и настоящем: популярный очерк* (Рыга 1935); *Православные церкви Латгалии: историко-статистическое описание* (Рыга 1936), *Преподобная Ефросиния, княжна Полоцкая* (Рыга 1938); *Полацкі князь Усяслаў – нацыянальны беларускі асілак* (Вільня 1939). В. Сахарава, С. Сахараў, *Выбраныя творы,* уклад., прадм., камент.: М. Казлоўскі, С. Панізьнік, Менск 2015, с. 14.

[123] К. Езавітаў, *Кароткі жыцьцяпіс і праходжаньне службы* [у:] *Беларуская мэмуарыстыка на эміграцыі,* укл.: Л. Юрэвіч, Нью-Ёрк 1999, с. 192.

[124] ГАРФ, ф. 5875, оп. 1, д. 11, л. 106–107 зв.

[125] AAN, sygn. 477, t. 5328, Raport Poselstwa RP w Rydze, Raport dot. działalności białoruskiej na Łotwie, 12 lutego 1939 r.

[126] LVVA, 3235 f., 5 apr., 1617 l., 5 lp.

Колькасныя змены беларускай меншасці ў Латвіі пасля 1934 г.

Нацыянальная палітыка Ульманіса паўплывала на колькасць тых, хто падчас усеагульнага перапісу насельніцтва Латвіі ў 1935 г. задэкларава ў беларускую нацыянальнасць. Нагадаем, што паводле вынікаў гэтага перапісу колькасць беларусаў склала 26 867 (1,38%) чал., што было на 9 162 чал. менш, чым падчас перапісу 1930 г.[127] Асноўныя змены тычыліся Земгаліі і Латгаліі, дзе на працягу 1930–1935 гг. колькасць беларусаў зменшылася амаль на траціну – з 27 275 (4,58%) да 16 724 (2,68%). У вёсках гэтых двух правінцый яны складалі 14 085 (2,67%), а ў гарадах – 2 639 (2,75%)[128]. Больш падрабязна прасачыць змены дазваляе інфармацыя, якую ўтрымліваюць гэтыя табліцы.

Табліца 48. Беларусы ў Латвіі ў 1935 г.

Мясцовасць	Каталікі	Праваслаўныя	Стараверы	Лютэране	Іншыя	Разам
Рыга	1 424	2 160	1 035	27	12	4 676
Відзэмэ	357	1 198	736	27	0	2 318
Рыга-павет	133	338	258	0	0	733
Кесь	56	126	93	6	0	281
Вальмера	48	148	36	8	0	240
Валка	64	232	51	5	0	352
Мадона	56	354	298	4	0	712
Курляндыя	329	709	255	18	5	1 318
Ліепая	87	354	92	8	2	543
Айзпутэ	23	52	15	1	1	92
Кулдыга	58	116	82	3	1	260
Венспілс	75	78	43	3	3	202
Талсэн	86	109	23	3	0	221
Земгалія	1 514	1 203	899	15	5	4 636
Тукумс	128	170	68	5	0	371
Елгава	233	391	264	6	3	897
Баўска	27	74	12	1	0	114
Екабпілс	60	213	173	2	1	449
Ілукшта	2 066	355	382	1	1	2 805

[127] *Ceturta tautas skaitīšana Latvijā 1935 gada*, sastādijīs V. Salnītis un redigējis M. Skujenieks, Rīga 1936, s. 108–288.

[128] *Ceturta tautas skaitīšana Latvijā 1935 gada*, sastādijīs V. Salnītis un redigējis M. Skujenieks, Rīga 1936, s. 330, 332.

Мясцовасць	Каталікі	Праваслаўныя	Старавераы	Лютэране	Іншыя	Разам
Латгалія	9 540	3 250	1 112	5	8	13 919
Даўгаўпілс	4 398	971	535	2	2	5 910
Рэжыкнэ	1 340	486	381	0	1	2 209
Лудза	3 777	1 206	163	1	5	5 152
Нова-Латгалія	25	587	33	2	1	648
Разам	14 164 (52,7%)	8 520 (31,7%)	4 037 (15%)	92 (0,3%)	54 (0,2%)	26 867 (100%)

Крыніца: *Ceturta tautas skaitīšana Latvijā 1935 gada*, sastādijīs V. Salnītis un redigējis M. Skujenieks, Rīga 1936, s. 108–121.

Табліца 49. Беларусы ў Латгаліі і Ілукшчыне паводле валасцей у 1935 г.

Мясцовасць	Колькасць
Ілукштанскі павет	
Грыва	243
Субата	83
Ілукшта	18
Акнінская	4
Асарская	30
Бебранская	2
Дземанская	218
Двіенценская	20
Гарсенская	3
Каплаўская	546
Курцумская	223
Ласенская	109
Калкунская	100
Пілсканская	52
Продская	21
Раўданская	24
Рубенская	3
Сіленская	119
Саліенская	463
Скрундалінская	167
Сусейская	10
Свенцская	338
Разам	2 805
Даўгаўпілскі павет і ваколіцы	
Даўгаўпілс	1 156

Мясцовасць	Колькасць
Краслава	216
Круствпілс	90
Лівенгоф	32
Прэлі	18
Гасціні	2
Айвіекская	43
Аўлеўская	87
Асунская	132
Бікерніекская	19
Дагдзенская	1
Ужвалдская	13
Ясмуйжская	27
Калупская	8
Капінская	105
Краслаўская	120
Крыжсборгская	129
Лікснснская	11
Лівенская	56
Наўенская	46
Прыдруйская	2 314
Прэльская	1
Пустынская	1 099
Рудзянская	21
Скайсценская	105
Унгумруйжская	41
Варкоўская	1
Выпенская	4
Вышкаўская	13
Разам	5 910
Лудзенскі павет	
Лудза	163
Карсава	15
Зілупэ	180
Брыгаўская	64
Цыблаўская	27
Істраўская	223
Корсаўская	69
Мердзенская	151
Наўтрэнская	79

Мясцовасць	Колькасць
Нірдзенская	4
Пасіенская	2 899
Пылдзенская	37
Рунданская	478
Шкяўненская	427
Звіргздэнская	336
Разам	5 152

Крыніца: *Ceturta tautas skaitīšana Latvijā 1935 gada,* sastādijīs V. Salnītis un redigējis M. Skujenieks, Rīga 1936, s. 358–360.

Па-ранейшаму самымі "беларускімі" былі на Лудзеншчыне: Пасіенская (40,77%) і Рунданская (11,22%) воласці[129]; на Даўгаўпілшчыне: Прыдруйская (34%) і Пустынская (25,7%). У пяці іншых валасцях беларусы складалі ад 5% да 10% насельніцтва, а ў дзевятнаццаці – ад 1% да 5%[130]. На Рэжыччыне па-ранейшаму выспай беларускасці была Букмуйжайская воласць, дзе было 1 241 (17,4% насельніцтва воласці) прадстаўнікоў гэтай нацыянальнасці. Тут пражывала ажно 56% усіх беларусаў Рэжыччыны. У трох іншых валасцях – Каўнацкай (165 чал./1,64%), Макашанскай (83/1%), Андрэпненскай (96/0,9%) – адзначаўся невялікі адсотак беларусаў[131].

Сярод тых, хто запісаўся беларусам, вяскоўцы складалі 18 138 (67,5%) (46 лютэранаў, 11 517 каталікоў, 4 154 праваслаўныя, 2 009 стараверaў), а гараджанамі 8 729 (32,5%) (3 966 праваслаўных, 2 647 каталікоў, 2 028 стараверaў, 46 лютэранаў).[132]. Сярод гараджан у 1935 г. беларусы складалі 1,23% усіх жыхароў латвійскіх гарадоў. Кіруючыся працэнтнай вагой, найбольш "беларускімі" былі: Зілупэ – 11,49%, Субата – 5,57%, Краславе – 5%, Крустпілс – 2,46%, Грыва – 4,38%, Лудза – 2,94%, Даўгаўпілс – 2,56%, Екабпілс – 1,84%, Баўска – 1,63%, Ілукшта – 1,38%, Рыга – 1,22%, Елгава – 1,20%[133]. Гэта дазваляе сцвярджаць, што на працягу 1925–1935 гг. адбывалася паступовае павелічэнне колькасці беларусаў у Рызе (з 4,18% да 17,4%), Курляндыі (з 1% да 4,9%)

[129] *Ceturta tautas skaitīšana Latvijā 1935 gada*, sastādijīs V. Salnītis un redigējis M. Skujenieks, Rīga 1936, s. 318.

[130] *Ceturta tautas skaitīšana Latvijā 1935 gada*, sastādijīs V. Salnītis un redigējis M. Skujenieks, Rīga 1936, s. 337.

[131] *Ceturta tautas skaitīšana Latvijā 1935 gada*, sastādijīs V. Salnītis un redigējis M. Skujenieks, Rīga 1936, s. 360.

[132] *Ceturta tautas skaitīšana Latvijā 1935 gada*, sastādijīs V. Salnītis un redigējis M. Skujenieks, Rīga 1936, s. 120–121.

[133] *Ceturta tautas skaitīšana Latvijā 1935 gada*, sastādijīs V. Salnītis un redigējis M. Skujenieks, Rīga 1936, s. 297–298.

і Відзэмэ (з 0,7% да 8,6%). Адначасова змяншалася лічба і адсотак беларусаў у Земгаліі (з 18,7% да 17,2%) і Латгаліі (з 75,3% да 51,8%). Звяртае на сябе ўвагу факт, што ў параўнанні з іншымі нацыянальнымі групамі толькі ў беларусаў назіраліся такія значныя змены[134].

Табліца 50. Колькасныя і працэнтныя змены беларусаў паводле месца пражывання ў 1925–1935 гг.

	Рыга	**Відзэмэ**	**Курляндыя**	**Земгалія**	**Латгалія**
1925	1 587 (4,18%)	266 (0,7%)	393 (1%)	7 140 (18,78%%)	28 624 (75,3%)
1930	4 751 (13,19%)	1 848 (5,13%)	992 (2,7%)	6 132 (17%)	22 306 (61,9%)
1935	4 676 (17,40%%)	2 318 (8,63%)	1 318 (4,91%)	4 636 (17,25%)	13 919 (51,8%)

Крыніца: *Ceturta tautas skaitīšana Latvijā 1935 gada,* sastādijīs V. Salnītis un redigējis M. Skujenieks, Rīga 1936, s. 292.

Павелічэнне колькасці беларусаў у "балтыйскай" частцы Латвіі адбывалася адначасова з памяншэннем іх лічбы ў Земгаліі і Латгаліі, дзе ў 1935 г. яны складалі адпаведна 1,45% і 2,45% насельніцтва. Нагадаем, што на пяць гадоў раней гэтыя лічбы выглядалі наступным чынам: 2,13% і 4,12%. Змены колькаснага складу латгальскіх і ілукштанскіх беларусаў дэманструе табліца.

Табліца 51. Працэнтная вага беларускага насельніцтва ў Латгаліі і Земгаліі ў 1930 і 1935 гг.

Паветы	**1930**	**1935**
Ілукштанскі	9	4,9
Даўгаўпілскі	6,69	2,78
Лудзенскі	5,3	5,5
Рэжыцкі	1,86	1,45
Нова-Латгальскі	1,24	0,59

Крыніца: *Ceturta tautas skaitīšana Latvijā 1935 gada,* sastādijīs V. Salnītis un redigējis M. Skujenieks, Rīga 1936, s. 294.

Памяншэнне колькасці беларусаў у Латвіі ў сярэдзіне 1930-х гг. нельга патлумачыць масавымі міграцыйнымі працэсамі (яны адсутнічалі) або

[134] *Ceturta tautas skaitīšana Latvijā 1935 gada,* sastādijīs V. Salnītis un redigējis M. Skujenieks, Rīga 1936, s. 292.

натуральным прыростам (ён заставаўся высокім). Латвійскія і замежныя гісторыкі пагаджаюцца, што ўсё менш людзей запісвалася беларусамі праз свядомую нацыянальную палітыку латвійскай улады. Вынікі перапісу 1935 г. адзначаюцца найбольшай тэндэнцыйнасцю і суб'ектыўнасцю ў параўнанні з папярэднімі. Перапісчыкі відавочна фальсіфікавалі звесткі пра нацыянальны склад насельніцтва. Аналіз анкет жыхароў Дземанскай воласці паказвае, што ў шматлікіх выпадках перапісчыкі выпраўлялі звесткі ў рубрыцы "нацыянальнасць" і "веданне дзяржаўнай мовы". У тых выпадках, дзе першапачаткова была запісана беларуская ці польская нацыянальнасць з няведаннем латышскай мовы, пазней з'явіліся "выпраўленні" нацыянальнасці на латышскую з веданнем дзяржаўнай мовы, а ў рубрыцы "мова, якую ўжываеш у сям'і" дадалася латышская. Улады такім чынам імкнуліся штучна надаць нацыянальна мяшаным памежным рэгіёнам латышскі нацыянальны характар, каб мацней знітаваць яго з латвійскай дзяржавай[135].

Парадаксальна, але ў разгляданы час фактычная лічба беларусаў у Латвіі павялічылася. Гэта адбылося за кошт беларусаў – польскіх грамадзян, якія прыехалі ў Латвію як сельскагаспадарчыя работнікі. Прычынай эканамічнай міграцыі была галеча, якая панавала ў заходнебеларускай вёсцы. Перанаселенасць і беспрацоўе на бацькаўшчыне супалі па часе з інтэнсіўным развіццём латвійскай сельскай гаспадаркі, якая адчувала вострую нястачу працоўных рук. Першая нешматлікая група гастарбайтараў з'явіліся ў Латвіі яшчэ ў 1928 г. З цягам часу іх колькасць сістэматычна расла, а ў 1930-я гг. з'ява набыла масавы характар. У 1935 г. было іх 41 089, у 1936 г. – 47 667, у 1937 г. – 47 824, у 1938 г. – 46 363 чал.[136] У перыяд з 1928 па 1939 гг. у латвійскай сельскай гаспадарцы працавала не менш як 97 тыс. польскіх эканамічных мігрантаў.

Табліца 52. Замежныя сельскагаспадарчыя рабочыя ў Латвіі ў 1929–1939 гг.

Гады	Рабочыя з Польшчы	Рабочыя з Літвы	Рабочыя з Эстоніі	Рабочыя з іншых краін	Разам
1929	654 (3,61%)	15 702 (86,7%)	1 479 (8,17%)	271 (1,5%)	18 106
1930	3 434 (10,5%)	18 820 (81,2%)	1 688 (7,2%)	232 (1%)	23 174
1931	4 358 (18,1%)	17 684 (73,6%)	1 752 (7,2%)	226 (0,9%)	24 020
1932	2 021 (14,6%)	10 181 (73,8%)	1 361 (9,8%)	229 (1,6%)	13 795
1933	4 678 (37,7%)	6 429 (51,8%)	1 027 (8.2%)	270 (2,1%)	12 404

[135] Ē. Jēkabsons, *Skład narodowościowy mieszkańców 6 gmin powiatu iłłuksztańskiego w XIX–XX w. jako główny powód sporu terytorialnego między Łotwą a Polską w okresie międzywojennym* [w:] *Granice i pogranicza. Historia codzienności i doświadczeń*, t. I, red. Marzena Liedke, Joanna Sadowska, Jan Trynkowski, Białystok 1999, s. 234.

[136] A. Stranga, *Kārļa Ulmaņa autoritārā režīma saimnieciskā politika 1934–1940*, Rīga 2017, s. 73.

Гады	Рабочыя з Польшчы	Рабочыя з Літвы	Рабочыя з Эстоніі	Рабочыя з іншых краін	Разам
1934	11 340 (49,3%)	9 272 (40,5%)	2 028 (8,8%)	214 (0,9%)	22 854
1935	16 885 (49,3%)	14 880 (43,5%)	2 181 (6,3%)	257 (0,7%)	34 209
1936	23 539 (59,2%)	15 236 (38,3%)	763 (1,9%)	211 (5%)	39 749
1937	27 586 (78,2%)	6 679 (19%)	511 (1,4%)	484 (1,4%)	35 260
1938	21 267	5 742	-	523	-
1939	12 737	3 563	-	449	-

W. Skowron, *Emigracja sezonowa do Łotwy z Ziem Wschodnich*, "Rocznik Ziem Wschodnich" 1938, s. 125; B. Kopeć, *Wychodźstwo sezonowe z Ziemi Wileńskiej do Łotwy*, Wilno 1938, s. 82; P. Starcs, *Darba spēka jautājums Latvijas lauksaimniecībā*, Rīga 1934, 37 lpp.; *Latvijas lauksaimniecība 1939*, Rīga 1940, 63 lpp.; *Latvijas lauksaimniecība 1938*, Rīga 1939, 63 lpp.

З табліцы вынікае, што да 1934 г. найбольшую групу сярод замежных работнікаў складалі літоўцы. У наступныя гады колькасную перавагу займелі эмігранты з Польшчы, якая з 1936 г. стала абсалютным лідарам па колькасці замежных сельскагаспадарчых рабочых у Латвіі.

Большасць польскіх сельскагаспадарчых мігрантаў складалі жыхары 15 паветаў Віленшчыны і Наваградчыны. У 1931 г. 82,4% усіх польскіх сезонных мігрантаў у Латвіі паходзіла з Віленшчыны[137]. Спачатку гэта былі жыхары толькі чатырох паўночных паветаў Віленскага ваяводства: Браслаўскага, Дзісненскага, Свянцянскага і Пастаўскага. Паступова ў міграцыйным руху пачалі ўдзельнічаць прадстаўнікі іншых куткоў Віленскага і Наваградскага краю. Доля выхадцаў з гэтых рэгіёнаў у 1935 г. складала амаль 79% усіх польскіх сезонных мігрантаў у Латвіі. У наступныя гады колькасць крыху зменшылася, але па-ранейшаму была высокая (52,7% у 1936 г.; 42,4% у 1937 г.). У 1937 г. амаль палова польскіх гастарбайтараў (10 тыс. чал.) пастаўляла паўночная Віленшчына (Браслаўскі, Дзісенскі і Вілейскі паветы), 4 тыс. паходзілі з астатняй часткі Віленскага ваяводства, 2 тыс. – з Наваградскага ваяводства (пераважна са Стаўпецкага павета) і толькі 6 тыс. – з цэнтральнай Польшчы[138].

Характэрнай рысай гэтай міграцыі была колькасная перавага маладых (18–25 гадоў) незамужніх жанчын над мужчынамі. Пры гэтым найбольшы працэнт дзяўчат адзначаўся сярод мігрантаў з Пастаўскага (93%), Вілейскага (90%), Дзісненскага (68%) і Маладзечанскага (68%) паветаў[139]. Вялікі адсотак

[137] LCVA, f. 156, ap. 1, b. 69, Pismo PUPP w Wilnie do EU, 17 XII 1931.

[138] L. Landau, *Wychodźstwo sezonowe na Łotwę i do Niemiec w 1937 roku: na podstawie ankiety Instytutu Gospodarstwa Społecznego*, Warszawa 1966, s. 15.

[139] W. Ormicki, *Struktura demograficzna wychodźstwa sezonowego z Ziemi Wileńskiej do Łotwy w roku 1935*, Wilno 1938, s. 10, 15.

жанчын тлумачыўся тым, што яны былі найбольш запатрабаваныя ў сельскай гаспадарцы Латвіі[140].

Табліца 53. Колькасць польскіх эканамічных мігрантаў з Віленшчыны і Навагрудчыны ў Латвіі

Ваяводства	1934	1935	1936	1937	1938
Віленскае	11 993	14 833	15 392	14 337	6 559
Навагрудскае	-	884	1 081	2 012	?
Разам	11 993	15 717	16 473	16 349	

Крыніца: B. Kopeć, *Wychodźstwo sezonowe z Ziemi Wileńskiej do Łotwy*, Wilno 1938, s. 102.

Ахвотных паехаць на працу да паўночнага суседа было вельмі шмат. Дадзеная з'ява прыцягнула ўвагу пісьменніка Мельхіёра Ваньковіча, які напрыканцы 1930-х гг. падарожнічаў па паўночна-ўсходніх паветах. Ён наступным чынам прадстаўляў сітуацыю: "*Селянін з дваццаці гектараў ідзе шукаць працу да пяцігектарнага латыша, які жыве за мяжой на той жа зямлі, спадчыне па той жа Расіі і пасля той жа вайны (...) У памежных паветах дзяўчаты, якія выязджаюць на працу ў Латвію (...), павінны мець даведку аб стане здароўя. Павятовы лекар кажа, што абследаваў 1400 дзяўчат. Вясковыя дзяўчаты стаяць у доўгай чарзе перад дзвярыма кабінета, з якога выходзяць з плямай калі не на целе, дык на душы*"[141]. Перавага прапановы над попытам стварала ўмовы для карупцыі і злоўжыванняў з боку мясцовых чыноўнікаў або латвійскіх агентаў. У 1934 г. польскае консульства у Рызе зафіксавала факт карупцыі: латышскі прадстаўнік патрабаваў ад кандыдатаў хабар ад 5 да 20 злотых за ўключэнне ў спіс на выезд у Латвію[142]. Варта працытаваць аповед жыхара Свянцянскага павета, які быў відавочцам шакуючай сцэны: "*Увесну 1935 года ў павятовай управе ў Свянцянах набіраліся жанчыны на сезонныя работы ў Латвію [...]. З досвітку каля 700 жанчын сабралася перад будынкам павятовай управы. А 8 гадзіне раніцы прыехаў агент з дапамогай паліцыі і абвясціў, што яму патрэбныя толькі 40 жанчын. Узняўся вэрхал, кожная з жанчын хацела з'ехаць за мяжу, каб зарабіць на кавалак хлеба. Каб патрапіць да агента, трэба было мець моцныя локці. Штурханіна была моцная, ды так, што два паліцыянты не змаглі прывесці натоўп у парадак. У гэтай бойцы адна маладая дзяўчына павалілася на зямлю і некаторы час яе таптаў натоўп, але калі яе нарэшце*

[140] LCVA, f. 156, ap. 1, b. 105, Pismo kierownika PUPP w Wilnie do Pawła Speciusa, 24 III 1934.

[141] M. Wańkowicz, *Było to dawno*, Warszawa 1980, s. 81.

[142] I. Palaša, *Darbaspēka imports Latvijas laukos starpkraru perioda*, магістарская праца, Rīga 2005, s. 64–65.

паднялі, у яе былі зламаныя абедзве нагі. Яна памерла ў той жа дзень у Свянцянах. Другой ахвяры дня, таксама маладой дзяўчыне, пашанцавала, бо яна атрымала толькі пералом нагі. Астатніх жанчын гэтая падзея не збянтэжыла і яны працягвалі штурхаць адна адну. Агент […] хутка зразумеў сітуацыю і пачаў бесчалавечна абыходзіцца з жанчынамі. Ён мацаў жаночыя грудзі, гучна жартаваў з тых, хто яму не падабаўся, […] браў хабар. А жанчыны са слязамі на вачах працягвалі, нячулыя да абразаў, ціснуцца, каб толькі выехаць у Латвію, бо дома панує галеча"[143].

Зразумець матывы выезду моладзі ў Латвію дазваляе выпадак, які апісаў віленскі журналіст, які ўвесну 1937 г. наведаў Крывічы (Вілейскі павет): "*Зараз на Віленшчыне адбываецца набор на сельскагаспадарчыя працы ў Латвію. Штодня дзяўчаты і хлапцы хвалямі прыходзяць з усіх бакоў у муніцыпальныя ўстановы, каб аформіць дакументы і атрымаць дазвол на выезд. Калі я прыехаў у Крывічы, невядома хто і калі раптам распусціў чуткі, што прыехаў агент з Латвіі вербаваць рабочых. З-за гэтага я трапіў у цікавую гісторыю. Да мяне падышлі з дзясятак-другі дзяўчат. Яны былі сарамлівыя і баязлівыя. Прыехалі ў гатэль […], я пачынаў з імі размову. Пытаюся ў бялявай дзяўчыны, чаму яна хоча ў Латвію. Яна з усмешкай адказвае: – Хачу зарабіць на пасаг! – Цябе і без пасагу возьмуць, – кажу ёй, – толькі за няўдачу даюць прыдачу. – Ой, што за халера, – кажа другая, – цяпер нашы хлапцы не на прыгажосць глядзяць, а на пасаг. – І многа яны патрабуюць? – Менш за ўсё сто рублёў золатам, – хорам адказваюць, – ці некалькі гектараў зямлі. – Пытаю: думаеце, што ў Латвіі можна зарабіць на пасаг? – Адказваюць: чаму не? Мінулым летам многія нашы сябры паехалі за мяжу, зарабілі немалыя грошы і вярнуліся*"[144].

Пэўная частка жыхароў Браслаўшчыны і Дзісненшчыны трапляла на працу ў Латвію нелегальна, пераходзячы польска-латвійскую дзяржаўную мяжу. У архіве Ваяводскай управы ў Вільні захоўваюцца пастановы пра арышт, выдадзеныя кіраўніцтвам памежных павятовых управаў. Напрыклад, у красавіку 1934 г. павятовы староста ў Відзах паведаміў у Віленскую ваяводскую ўправу, што падчас вярбоўкі сельскагаспадарчых работнікаў у Латвію два жыхары Дзісненскага павета Аляксей Кухта і Уладзімір Стахоўскі нелегальна выехалі туды на сезонныя работы[145]. Тым часам, жыхар Браслаўскага павета Уладзіслаў Адахоўскі быў асуджаны гарадскім судом у Браславе на

---

[143] J. Chałasiński, *Młode pokolenie chłopów. Procesy i zagadnienia kształtowania się warstwy chłopskiej w Polsce*, t. 2: *Świat życia, pracy i dążeń kół młodzieży wiejskiej*, Warszawa 1938, s. 73.

[144] *Wśród kandydatek na wyjazd do Łotwy (Wrażenia dziennikarza Wileńskiego z Krzywicza)*, "Nasze Życie" 1937, № 124, s. 18.

[145] LCVA, f. 51, ap. 7, b. 813, Pismo Starosty Powiatowego w Dziśnie do Wydziału Bezpieczeństwa WUW, 26 VII 1934, l. 11.

месяц зняволення за нелегальны пераход польска-латвійскай мяжы. Гэты выпадак, аднак, не адбіў у яго жадання знайсці працу ў Латвіі[146]. Польскія ўлады спрабавалі прадухіліць спробы нелегальных выездаў: міграцыйная ўправа падала кіраўніцтву Віленскага ваяводства просьбу аб узмацненні памежнага кантролю, каб не прапускаць праз польска-латвійскую мяжу работнікаў без пропускаў і кантрактаў[147]. З 10 красавіка па 9 траўня 1934 г. польская памежная варта затрымала 18 чалавек, якія спрабавалі нелегальна перайсці польска-латвійскую мяжу. У перыяд з 1 траўня па 2 чэрвеня 1935 г. адбылося яшчэ 48 спроб нелегальнага пераходу мяжы[148]. Немагчыма вызначыць памеры нелегальнай эміграцыі ў Латвію, бо гэтыя выезды не ахоплівала афіцыйная статыстыка. Захаваліся толькі фрагментарныя звесткі, якія тычыліся асобных гадоў. Паводле звестак Сельскагаспадарчай палаты Латвіі, колькасць нелегальных работнікаў, занятых у сельскай гаспадарцы краіны, складала каля 5 000 чал. – у 1935 г. і 2 тыс. – у 1936 г.[149]

Праблематычна адказаць, колькі беларусаў было сярод мігрантаў, бо далёка не ўсіх жыхароў паўночна-ўсходніх ваяводстваў міжваеннай польскай дзяржавы можна лічыць беларусамі. У рэальнасці польская эканамічная міграцыя ў Латвіі вызначалася нацыянальнай разнастайнасцю. Паводле звестак польскай міграцыйнай службы, нацыянальны склад мігрантаў у Латвіі быў наступны: палякі – 60 тыс. чал. (61,5%), беларусы і ўкраінцы – 37,5 тыс (38,5%)[150]. Аднак колькасць апошніх была нязначнай. Ёсць, аднак, падставы меркаваць, што звесткі афіцыйнай статыстыкі не цалкам рэалістычныя. Падчас вызначэння нацыянальнасці мігрантаў у Латвіі польскія ўлады кіраваліся вынікамі ўсеагульных перапісаў насельніцтва. Аднак мы ведаем, што гэтыя перапісы мелі хібы – праз палітычны ціск на рэспандэнтаў і аб'ектыўныя цяжкасці з вызначэннем нацыянальнасці значнай часткі жыхароў 2-й Рэчы Паспалітай. Улады былі схільныя заніжаць колькасць непалякаў у этнічна неаднародных раёнах, з якіх паходзіла большасць польскіх сезонных рабочых у Латвіі.

Уяўленне пра колькасць беларусаў можа даць канфесійная статыстыка: нацыянальная прыналежнасць на ўсходніх тэрыторыях міжваеннай польскай дзяржавы традыцыйна атаясамлівалася з рэлігійнай. Дзейнічала правіла: каталік – паляк, праваслаўны – беларус. У сувязі з гэтым варта прааналізаваць канфесійны склад мігрантаў. Дамінантнай групай былі каталікі –

---

146 LVVA, 3219 f., 1 apr., 11718 l., Akta Władysława Adachowskiego.

147 LCVA, f. 156, ap. 1, b. 69, Pismo Urzędu Emigracyjnego do Urzędu Wojewódzkiego w Wilnie, III 1931.

148 H. Janowska, *Emigracja zarobkowa z Polski 1918–1939*, s. 215.

149 B. Kopeć, *Wychodźstwo sezonowe z Ziemi Wileńskiej do Łotwy*, s. 105.

150 H. Janowska, *Emigracja zarobkowa z Polski 1918–1939*, Warszawa 1981, s. 244.

у 1935 г. яны складалі 57,65% польскіх сезонных мігрантаў у Латвіі. Другое месца займалі праваслаўныя, якіх у 1935 г. было 34,5 %. Праваслаўныя пераважалі сярод выхадцаў з Маладзечанскага (80,4%), Дзісненскага (67,5%), Вілейскага (57%) і Стаўпецкага (52,3%) паветаў. Каталікі складалі большасць сярод работнікаў, якія паходзілі са Свянцянскага (89,5%) і Браслаўскага (67,2%) паветаў[151].

Атаясамліванне каталіцкага веравызнання з польскай нацыянальнасцю, а праваслаўнага – з беларускай было толькі часткова правільным. Доля беларўсаў сярод каталікоў часамі была значнай[152]. Таму вызначыць дакладную колькасць беларусаў сярод мігрантаў немагчыма. З упэўненасцю можна, аднак, сцвярджаць, што лічба рабочых беларускай нацыянальнасці была вышэйшая за паказаную афіцыйнай статыстыкай. Можна меркаваць, што яны складалі каля паловы ўсіх польскіх сельскагаспадарчых мігрантаў. Гэта адпавядае назіранням заходнебеларускай прэсы, якая лічыла, што ў Латвіі працавала не менш як 40 тыс. беларусаў[153]. Ускосна гэта прызнавалі таксама польскія ўлады. Падчас дыскусіі ў МЗС з боку некаторых палітыкаў і знаўцаў міграцыйнай праблематыкі гучала шкадаванне, што працоўная міграцыя ў Латвіі складаецца з няпольскага элементу, які ў вачах замежнікаў шкодзіць рэпутацыі польскай дзяржавы[154]. Высокі адсотак беларусаў сярод гастарбайтараў тлумачыцца двума фактарамі: 1) тэрыторыяй, на якой адбывалася вярбоўка і 2) вялікім адсоткам беларусаў у сялянскай супольнасці (у беларусаў ён быў значна вышэйшы чым у палякаў)[155].

Большасць сельскагаспадарчых рабочых у Латвіі працавала ў гаспадарках, размешчаных у найбольш заможных правінцыях – Відзэмэ, Земгаліі і Курляндыі. Прызвычаеныя да цяжкіх умоў працы і хатніх будняў на радзіме, работнікі-беларусы не мелі падстаў скардзіцца на кепскае жыццё на чужыне. Нягледзячы на цяжкую працу, яны не шкадавалі пра выезд у Латвію, бо гэта быў адзіны спосаб вырвацца з галечы, якая панавала на бацькаўшчыне. Цярплівасць і трываласць работнікаў з Віленшчыны

---

[151] W. Ormicki, *Struktura demograficzna wychodźstwa sezonowego z Ziemi Wileńskiej do Łotwy w roku 1935*, s. 11–12, 16.

[152] LCVA, f. 156, ap. 1, b. 69, Wykaz robotników, zrekrutowanych w kwietniu 1931 r. na roboty rolne sezonowe do Łotwy.

[153] Kor-t, *Biełaruskija sezonnyja rabotniki viartajucca u Zachodniuju Biełaruś*, "Krynica" 1939, № 12, s. 2.

[154] AAN, MSZ, t. 9896, Protokół z posiedzenia Międzyministerialnej Konferencji Emigracyjnej, 25 II 1938, k. 10.

[155] Сярод палякаў сяляне складалі 45%, а сярод беларусаў ажно 88–90%. У 1931 г. у Польшчы пражывала 16,4 млн сялян, з якіх палякамі былі 9,7, украінцамі – 4, беларусамі – 1,9, немцамі – 0,4, іншымі – 0,3. J. Żarnowski, *Społeczeństwo Drugiej Rzeczypospolitej 1918–1939*, Warszawa 1973, s. 184.

і Наваградчыны былі прычынай таго, што латышскія гаспадары цанілі іх больш за мігрантаў з цэнтральнай Польшчы, якіх часта неахвотна бралі на працу[156]. Першапачаткова міграцыйны рух у латвійскую дзяржаву меў сезонны характар, а час знаходжання ў Латвіі ў сярэднім складаў паўгода. Аднак у Латвіі сяляне знайшлі лепшыя чым на радзіме ўмовы працы і заробкі, таму ахвотна працягвалі працоўныя кантракты, а нават наважваліся заставацца настала ў гэтай краіне. З цягам часу міграцыя пачала губляць сезонны характар і набывала рысы паўсталай або сталай[157].

Зароблены ў Латвіі грошы эмігранты высылалі родным дадому. Аднак некаторыя ўхіляліся ад сямейных абавязкаў, пакідаючы сваіх блізкіх без сродкаў для існавання. Сведчаць пра гэта скаргі сваякоў эмігрантаў у польскае консульства ў Рызе. Прыкладам, Алена Кароль прасіла знайсці яе мужа Язэпа Караля, які выехаў на працу ў Латвію і не дасылаў ёй грошай. У лісце чытаем: "*Мой Язэп Кароль застаецца ў Латвіі. Маю з ім дачку, якой зараз 7 гадоў. Муж зарабляе грошы ў Латвіі, але адпраўляе іх сваякам, а мне даводзіцца цярпець галечу і нядолю. Верагодна, ён знайшоў іншую жанчыну ў Латвіі. Муж мае 5 га ўласнай зямлі на хутары і 10 га атрымаў у пагосце. Маючы гэтулькі зямлі, не варта было яму ехаць у Латвію, дзе ён дэнацыяналізуецца і маральна разбэшчваецца. Паколькі я маю інваліднасць, не магу працаваць. Таму прашу польскае консульства выслаць майго мужа з Латвіі або абавязаць яго выплачваць аліменты на ўтрыманне мяне і майго дзіцяці*"[158]. Каб не дапусціць падобных сітуацый, консульства ў Рызе ў 1938 г. пачало друкаваць у польскай мясцовай прэсе прозвішчы рабочых, якія мелі запазычанасці па плацяжах. У якасці прыкладу можна прывесці наступную абвестку: "*Дзяніс Цмок 1906 г. н., з в. Лайбуны Відзаўскай воласці Браслаўскага павета, з 1936 г. на працы ў Латвіі. Пакінуў на радзіме жонку і дзяцей, якім ніякай дапамогі не аказвае, гатовы зусім кінуць сям'ю. Карыстаецца даверлівасцю работніц*"[159].

У Латвіі рабочыя атрымлівалі новы жыццёвы досвед і магчымасць пазнаёміцца з іншай культурай. Большасць мігрантаў была пад уражаннем ад мясцовай сельскагаспадарчай культуры, узровень якой быў значна вышэйшы за той, што панаваў на бацькаўшчыне. Але назіраліся і адмоўныя наступствы, як незапланаваныя цяжарнасці і пазашлюбныя дзеці, што было вынікам выпадковых палавых кантактаў. Такія выпадкі не былі рэдкія. Даследчык сезоннай міграцыі Багдан Копец дзяліўся назіраннямі:

---

[156] LCVA, f. 51, ap. 7, b. 813, Sprawozdanie z działalności Punktu Sanitarno-Zbiorczego PCK w Turmoncie, IV 1934.

[157] AAN, MSZ, t. 11605, Pismo konsula RP w Rydze, 19 I 1936, k. 2.

[158] LVVA, 3219 f., 1 apr., 12665 l., List Heleny Korol do Konsulatu RR w Rydze, 28 II 1939, 4 l.

[159] *Komunikaty Konsulatu RP w Rydze*, "Nasze Życie" 1938, № 188, s. 12.

"*Дастаткова паехаць у вёскі і ваколіцы ў Браслаўскім павеце, большая частка насельніцтва якога ездзіць у Латвію, каб пераканацца, як павялічваецца там 'натуральны прырост', як амаль у кожнай вёсцы можна знайсці хоць адно пазашлюбнае дзіця, прывезенае з Латвіі*"[160].

Галеча мігрантаў спрыяла фарміраванню ў латышоў своеасаблівага стэрэатыпу. Нярэдка рабочыя станавіліся героямі сатырычных апавяданняў і жартаў у мясцовым друку[161]. У латвійскай прэсе з'яўляліся артыкулы пра іх нізкі ўзровень культуры і неразважлівыя паводзіны[162]. У 1938 г. адбыўся польска-латвійскі дыпламатычны скандал, калі на сцэнах латвійскіх тэатраў з'явілася п'еса Вальдэмарса Зонбергса (*Voldemārs Zonbergs*) *Мост зламаных сэрцаў*. Адным з персанажаў быў сезонны работнік Арсен, які не ведаў латышскай мовы, таму ствараў праблемы гаспадару. Хаця гэтая роля была другасная, а герой паказаўся на сцэне ўсяго некалькі хвілін, у віленскай прэсе з'явіліся крытычныя галасы, маўляў, аўтары п'есы здзекуюцца з польскіх грамадзян[163].

Беларускія рабочыя ўспрымаліся ў латвійскім грамадстве як польскія грамадзяне. Іх нацыянальнасць не бралася пад увагу падчас перапісаў насельніцтва, таму фармальна яны не павялічвалі колькасці беларусаў у Латвіі. Аднак з'яўленне заходнебеларускіх рабочых у Латвіі не засталося па-за ўвагай мясцовых беларускіх актывістаў. Спачатку дзеячы мясцовага беларускага руху разглядалі прыезд сельскагаспадарчых мігрантаў з Польшчы як праяву пашырэння польскага нацыяналізму[164]. Напрыклад, на старонках газеты "Думка беларуса" выказвалася меркаванне, што прыезд у Латвію польскіх сезонных рабочых выкліча хвалю беспрацоўя ў краіне[165]. Аднак з цягам часу беларускія дзеячы пачалі разумець, што значная частка польскіх сельгасмігрантаў – заходнебеларускія сяляне. Апошнія ў вачах мясцовага беларускага актыву выглядалі як ахвяры "польскага прыгнёту". Прыкладам кантакту паміж латвійскімі беларусамі і польскімі сельскагаспадарчымі рабочымі беларускага паходжання можа быць сустрэча С. Сахарава з дзвюма работніцамі з Пастаўшчыны, якіх ён пабачыў на Рыжскім узбярэжжы. Выданне "Беларуская школа ў Латвіі" наступным чынам каментавала падзею: "*Першай спробай устанавіць кантакт з прыязжаючымі ў Латвію на сезонныя работы нашымі братамі і сёстрамі з Заходняй Беларусі. Нам пададзены поўныя імёны і прозвішчы дзвюх дзяўчат з Пастаўскага павета, але мы пакуль што не адзначаем іх імёнаў, гміны і вёскі, бо ведамо, што за*

---

[160] B. Kopeć, *W sprawie emigracji sezonowej do Łotwy*, s. 5.

[161] A. Skrzypek, *Stosunki polsko-łotewskie 1918–1939*, Gdańsk 1997, s. 132.

[162] *Jeszcze jedna ofiara własnej naiwności*, "Nasze Życie" 1937, № 116, s. 18.

[163] AAN, MSZ, t. 10021, Pismo Poselstwa RP na Łotwie, 21 I 1939, k. 34–35.

[164] *Паланізацыя ў Латвіі*, "Беларускае слова" 1931, № 1, s. 3.

[165] *Ілукштанскі павет. Аб палёнізацыі*, "Думка беларуса" 1931, № 2, с. 2.

кожную праяву нацыянальнае свядомасці польскія акупацыйныя ўлады помсціцца на гэтых дзяўчатах па звароце іх на бацькаўшчыну"[166].

Аднак падобныя кантакты мелі спарадычны характар. Бліжэйшаму супрацоўніцтву не спрыяў шэраг фактараў. Найбольш масавая працоўная эміграцыя з Заходняй Беларусі ў Латвію назіралася ў другой палове 1930-х гг., калі беларускі рух быў у заняпадзе. Як польскія грамадзяне, мігранты не мелі права ўступаць у грамадскія арганізацыі беларускай меншасці Латвіі. Акрамя таго, мігранты не цікавіліся грамадскай дзейнасцю, а ў Латвію прыехалі на заробкі. Толькі адзінкі з іх перад выездам за мяжу ўдзельнічалі ў беларускім нацыянальным жыцці. Адным з такіх быў Браніслаў Даніловіч, жыхар Ашмянскага павета. 6 траўня 1937 г. ён накіраваў ліст у рэдакцыю віленскага часопіса "Шлях моладзі", у якім скардзіўся на нястачу беларускага друку ў Латвіі. Ён падкрэсліваў, што без беларускай газеты "на чужыне не абыдзешся, не пачуўшы роднай мовы, толькі ламаную рускую і латышскую". Аўтар звяртаў увагу на неабходнасць пашырэння беларускай нацыянальнай свядомасці сярод беларусаў – сезонных работнікаў, якія, кінутыя на волю лёсу, хутка дэнацыяналізаваліся. Рабочы прасіў даслаць яму беларускую прэсу, якую ён хацеў распаўсюдзіць сярод мігрантаў[167].

Актывізацыя беларускага руху напярэдадні і на першым этапе II сусветнай вайны

Напрыканцы 1930-х гг. у свеце наспявалі грунтоўныя змены. Над Еўропай навісла пагроза новай вайны. Параскіданы па еўрапейскіх сталіцах беларускі актыў сачыў за падзеямі і намагаўся спрагназаваць, як яны могуць паўплываць на стан беларускай справы. У абмеркаванні міжнародных падзей удзельнічалі і латвійскія беларусы, найперш К. Езавітаў. У лісце старшыню Рады БНР Васілю Захарку ён пісаў: "*Мы жывём у такую пару, калі часта падзеі прыносяцца з паспешнасцю маланкі. Парахавая бочка, на якой сядзіць пані Еўропа так перапоўнена, што мусіць разарвацца. Пытанне толькі калі. Усе чакаюць і гатуюцца спаткаць гэтыя падзеі больш узброенымі, хто аружжам, а хто рэвалюцыйна-нацыянальнай сілай. Трэба гатавацца і нам. Наша сіла гэта нацыянальная свядомасць беларускага народа, якую і трэба як мага пашыраць*"[168]. Старшыня Рады БНР лічыў, што перад абліччам

---

[166] *Праца Беларускага Навукова-Краязнаучага Т-ва*, "Беларуская школа ў Латвіі" 1933, № 6(23), с. 342.

[167] Б. Даніловіч, *Ліст з Латвіі ў рэдакцыю віленскага часопіса "Шлях моладзі"*, "Запісы БІНіМ" 2014, т. 37, с. 619–620.

[168] ГАРФ, ф. 5875, оп. 1, д. 11, л. 109.

палітычных і мілітарных перамен у свеце, беларускія дзеячы павінны актывізаваць сваю дзейнасць і аб'яднацца ў барацьбе за беларускую справу. У Празе адбылася канферэнцыя беларускіх эмігрантаў ЧСР, на якой было вырашана, што ўрад БНР мае ўсталяваць цесныя кантакты з беларускімі асяродкамі ў Польшчы, Літве, Латвіі і ЗША, каб скаардынаваць сілы. Яшчэ ў красавіку 1938 г. В. Захарка ў лісце К. Езавітаву выказаў задавальненне тым, што ў Латвіі існуе беларускі нацыянальны асяродак і пытаўся, хто ім кіруе або можа ачоліць у выпадку патрэбы[169].

29 снежня 1938 г. старшыня Рады БНР звярнуўся да беларускіх дзеячаў Латвіі, згуртаваных вакол ТБНЛ, і заклікаў іх актывізаваць грамадскую дзейнасць: "*Не сярдуйце на мяне за такія запытанні. Зразумейце, што мы жывём у такую пору, калі можа наступіць такі мамэнт, што ўсё гэта будзе вельмі патрэбна. Усюды-ўсе адчуваюць надыходзячыя вялікія падзеі і пэўна гатуюцца да іх. Нешта падобнае хацелася б бачыць і на беларускіх землях. Зразумелая рэч, толькі на сіле народа можа быць абаперта тая ці іншая акцыя. Немалую энергію павінна выяўляць і эміграцыя. Але, як ведама, эміграцыя не ёсць сама сіла, яна толькі водгук свайго народа. Калі няма руху народа, та не могуць быць і моцнымі: інфармацыі, доказы і запатрабаванні эміграцыі. Запатрабаванне без падмацавання мала калі чаго варта. Гэта агульны закон, якога і нам не абмінуць. Дзеля гэтага я вельмі прашу вас рухацца, рухацца і яшчэ раз рухацца. Даражэнькія, рабеце гэта хаця б напалову таго, што робяць іншыя пагвалчаныя народы*"[170]. Акрамя таго, В. Захарка цікавіўся ці маюць латвійскія беларусы ў сваіх шэрагах аўтарытэтных асоб, здольных узяць на сябе цяжар арганізацыйнай і нацыянальнай працы перад абліччам змен, што чакаюцца ў свеце: "*Добра было б ведаць, што ў вас ёсць і што можа быць цэнтрам, і хто ёсць ці можа быць цэнтральнай фігурай*"[171].

Тым часам, адносіны паміж трыма "старымі" лідарамі латвійскіх беларусаў – М. Дзямідавым, К. Езавітавым і У. Пігулеўскім – не выглядалі найлепшым чынам. Уяўленне старшыні Рады БНР пра настроі мясцовага беларускага

---

[169] В. Захарка пісаў К. Езавітаву: "*Я быў бы надзвычайна ўдзячны табе, калі-б ты безадкладна паведаміў мяне аб тым, хто кіруе ў Рызе нацыянальна-незалежніцкай працай, або часткай яе, выяўленнем якой ёсць толькі што прыведзеная мною дзейнасць моладзі. Думаю, што не Дзямідаў і не Уладзімір. Апошні, як ён піша, усё яшчэ страдае ад беспрацоўя. Ці ёсць у Латвіі, а асабліва ў Рызе і Дзвінску, якія-колечы нацыянальна-незалежніцкія арганізацыі? Што робяць вучыцелі зачыненых школаў, як Сіцько, Рэдзька, Барткевіч, Якубецкі. Вельмі рад, што як у Латвіі, так і ў Вільні, пачынаюць падаваць голас маладыя працаўнікі*". ГАРФ, ф. 5875, оп. 1, д. 11, л. 109.

[170] ГАРФ, ф. 5875, оп. 1, д. 11, л. 121.

[171] AAN, 477, t. 5328, Raport Poselstwa RP w Rydze dot. działalności białoruskiej na Łotwie, 12 II 1939 r.

актыву склаліся пад уплывам К. Езавітава, з якім В. Захарка актыўна перапісваўся. Першы ў лістах намагаўся выставіць у як мага горшым святле сваіх даўніх апанентаў. Так, 8 сакавіка 1938 г. К. Езавітаў пісаў В. Захарку: "*У Рызе бачыўся са сваімі былымі вучнямі – цудоўная моладзь. Але ходу ім няма – працуюць на фабрыках. Бачыў і старэйшых – яны як мышы пад венікам. Адзін С. Сахараў збірае нашыя народныя спевы і рыхтуе зборнік да друку. Мікола* [Дзямідаў – ЕГ] *дастаў трамваем па галаве (не жартую: трапіў пад трамвай), зара паправіўся, але ў думках яшчэ большы зрабіўся непарадак. Чытае лекцыі моладзі. Моладзь слухае і думае, ці хутка кончыць, каб можна было паскакаць. Я быў адзін раз, плюнуў і пайшоў дахаты. Плануе чалавек зрабіцца ўніяцкім біскупам і зарабіць на гэтым грошы. Быў на праваслаўным багаслоўскім інстытуце. Пігула* [У. Пігулеўскі – ЕГ] *вучыць мове. Ён атрымоўвае добрую пенсію, жыве бесклапотна адносна сябе і адносна справы*"[172].

Асабліва крытычна К. Езавітаў выказваўся пра М. Дзямідава, які, паводле яго словаў, дапамагаў латышскім нацыяналістам аблатышваць беларускую моладзь. Ён адзначаў, што М. Дзямідаў пагадзіўся стаць настаўнікам польскай мовы ў латышскай школе, адчыненай у будынку, дзе месцілася 2-я Рыжская беларуская школа[173]. У чарговым лісце (18 красавіка 1938 г.) В. Захарку К. Езавітаў пісаў: "*Я не магу сабе нават уявіць як можна пакінуць Рыгу як бы на ласку Дзямідава. Можа быць ён і найлепшы чалавек, але ж з паводжаннем гэтага чалавека ніяк няможна пагадзіцца. На што гэта падобна, сённека ён вучыцель беларускай школы, а заўтра вучыцель латышскай школы, сённека праваслаўны, а заўтра ўніят і г.д. Сам бы чалавек няхай сабе піў бы гарэлку хоць цэлымі гарцамі і ламаў бы галаву па пяць разоў у дзень і да гэтага нікому дзела не было б. Але калі такі чалавек звязвае з сваім блудам нацыянальнаю справу, тады самы мус вымагае ад кожнага ідэйнага беларуса сказаць яму: Стойце і апамятайцеся*"[174].

Каб улагодзіць рознагалоссі сярод лідараў латвійскіх беларусаў, у лютым 1939 г. у Рыгу на даручэнне В. Захаркі завітаў Янка Станкевіч. Фармальнай

---

[172] ГАРФ, ф. 5875, оп. 1, д. 11, л. 107 зв.

[173] У артыкуле К. Езавітава чытаем: "*І можа здарыцца, што дзякуючы суседству (...) ды пабачыўшы свайго былога вучыцеля, нехта з вучняў беларускіх школ і заблудзіць – і пападзе ў дзверы не сваёй беларускай школы, а ў дзверы школы агульнага дэпартамента. І вось, каб дагадзіць латвійскім уладам, гр. Дзямідаў шчыра працуе на іх карысць, агітуючы, каб дзеці з беларускай школы пераходзілі туды. Дзе толькі словамі няможна пераканаць, там ідзе на дапамогу і фляшка гарэлкі. Зараз ужо дзякуючы гэткім ягоным 'шчырым старанням' 5 вучняў-беларусаў з беларускай пачатковай школы выступілі і перайшлі ў новаадчыненую школу агульнага д-та. Гр. Дзямідаў гэтым яшчэ не абмежаваўся і далей стараецца 'ўслужваць' латышам*". Задзьвінскі, *Латвійская процібеларуская тактыка*, "Беларуская крыніца" № 5 ад 28 студзеня 1935 г., с. 2.

[174] ГАРФ, ф. 5875, оп. 1, д. 11, л. 109.

нагодай быў акадэмічны візіт у Латвійскі ўніверсітэт, але сапраўднай мэтай быў збор звестак пра стан беларускай справы ў латвійскай дзяржаве. Паездка віленскага беларуса ў Латвію прыцягнула ўвагу польскіх улад, якія палічылі яе праявай нелаяльнасці. Палякі не мелі нічога супраць акадэмічных кантактаў Я. Станкевіча з рыжскай прафесурай, але кантакты з мясцовым беларускім актывам успрымалі як заангажаванасць у палітыку і шкоду польскім інтарэсам. Невыпадкова, на латвійскай мяжы польскія памежнікі зрабілі пільны надгляд рэчаў Я. Станкевіча і канфіскавалі "недазволеную літаратуру": 30–40 асобнікаў беларускага календара, у якім, нібыта, быў здымак Карла Маркса[175].

Супрацоўнікі польскага пасольства ў Рызе ўважліва сачылі за кожным крокам Я. Станкевіча, таму ў польскіх крыніцах захаваліся падрабязныя звесткі пра яго знаходжанне ў латвійскай сталіцы. У Рызе Я. Станкевіч правёў перамовы з К. Езавітавым, У. Пігулеўскім і М. Дзямідавым пра аб'яднанне сіл дзеля кансалідацыі беларускай дзейнасці ў Еўропе. Больш падрабязныя звесткі дае рапарт польскага пасольства: "*Станкевіч прыбыў у Рыгу 9.II. разам з экскурсіяй 'Орбісу'. Пра ягоны прыезд былі загадзя папярэджаныя два тутэйшыя лідары, Пігулеўскі і Езавітаў. Езавітаў паінфармаваў пра гэта трэцяга з лідараў, Дзямідава, прапануючы яму зладзіць сустрэчу. Тое ж зрабіў Пігулеўскі за пасрэдніцтвам кіраўніка школы ў Рызе Сіцько. Адмысловага павітання Дзямідаў, аднак, не зрабіў, выйшаўшы сам на вакзал і забраўшы Станкевіча на сваю прыватную кватэру. Пра свой прыезд Станкевіч паведаміў праз тэлефон Езавітаву, які адразу ж параіў яму не заставацца даўжэй у гасцях у Дзямідава і спыніцца ў гатэлі, паколькі ў адваротным выпадку 'Дзямідаў будзе кантраляваць усе размовы'. Станкевіч прыслухаўся да парад Езавітава. С.[танкевіч] наведаў, таксама, Пігулеўскага, а тым часам сустрэўся таксама з шэрагам беларускіх настаўнікаў. Увечары наступнага дня Станкевіч накіраваўся да Дзямідава, якога пераконваў дыстанцыявацца ад якой-колечы грамадска-палітычный дзейнасці. 10 лютага, у часе пасяджэння таварыства настаўнікаў, Станкевіч абвінавачіў Дзямідава ў парушэнні дысцыпліны і разбурэнні 'адзінага беларускага фронту' ў сувязі з чым Дзямідаў з плачам апраўдваўся. Трэцяя размова на гэты ж конт адбылася 11 лютага. Падчас гэтай размовы Станкевіч патлумачыў, якую тактыку павінны абраць беларусы ў адносінах да латышоў. У рэальнасці словы Станкевіча былі выразным абвінавачваннем Дзямідава. Ён звярнуў увагу на тое, што нешматлікая інтэлігенцыя не павінна раздрабняць свае сілы, а наадварот мусіць гуртавацца вакол асобы 'фюрэра'. За такога С.[танкевіч] лічыць Пігулеўскага як чалавека з вялікім досведам*

[175] AAN, sygn. 477, t. 5328, Raport Poselstwa RP w Rydze, Raport dot. działalności białoruskiej na Łotwie, 12 lutego 1939 r.

і тактам, былога дэпутата, г.зн. вядомага чалавека (...) Станкевіч пакінуў Рыгу 12 лютага"[176].

Назіранні польскіх дыпламатаў немагчыма належным чынам верыфікаваць з прычыны адсутнасці альтэрнатыўнай крыніцы. Аднак далейшы ход падзей у жыцці беларусаў Латвіі яскрава прадэманстраваў, што акрэсленая аўтарамі польскага рапарту кіраўнічая роля У. Пігулеўскага была перабольшаная. У разгляданы час дзеяч не праяўляў актыўнасці, саступаючы месца іншым, перадусім прадстаўнікам маладога пакалення мясцовай беларускай інтэлігенцыі.

З прычыны актывізацыі нацыянальнага актыву ў розных еўрапейскіх краінах павялічылася ўвага польскіх улад да беларусаў у Латвіі. У лютым 1939 г. пасольства ў Рызе на загад МЗС падрыхтавала адмысловы рапарт пра стан беларускага жыцця ў Латвійскай Рэспубліцы. На думку аўтараў дакумента, пасля травеньскага перавароту найбольш дзейныя латвійскія беларусы згуртаваліся вакол трох правадыроў: У. Пігулеўскага, К. Езавітава і М. Дзямідава, кожны з якіх па-свойму намагаўся ўплываць на суайчыннікаў. Заслугоўвае ўвагі тое, як польскія дыпламаты характарызавалі згаданых дзеячаў: "*Езавітаў змагаецца з Пігулеўскім за душы сваіх суродзічаў. Езавітаў выступае, таксама, супраць Пігулеўскага на старонках беларускіх выданняў за мяжой, вінавацячы яго ў паланафільстве або наўпрост называючы 'польскім агентам', нягледзячы на тое, што адсутнічаюць якія-колечы доказы акрамя неабгрунтаваных плётак. Дзямідаў, беспартыйны, лаяльны ў адносінах да Латвіі, намагаецца фарсіраваць накірунак латвійска-дзяржаўніцкі і выкарыстоўвае дзеля гэтай мэты адзіную беларускую арганізацыю, Таварыства настаўнікаў. У сувязі з гэтым як Пігулеўскі, так і Езавітаў намагаюцца ў вачах беларусаў дыскрэдытаваць яго як латышскага агента (...) У 1935–1938 г. дзейнасць Езавітава абмяжоўвалася агітацыяй у Латгаліі, куды ён і яго прыхільнікі выязджалі кожнае лета на адпачынак. Пігулеўскі*

[176] AAN, sygn. 477, t. 5328, Raport Poselstwa RP w Rydze, Raport dot. działalności białoruskiej na Łotwie, 12 lutego 1939 r. Падмацоўваючы свае высновы наконт падтрымкі, аказанай Я. Станкевічам У. Пігулеўскаму, польскія дыпламаты спасылаліся на публікацыю ў віленскай газеце "Беларускі фронт" (№ 4 за 1939 г.), аўтар якой на падставе звестак выдання "Ilustrowany Kurier Codzienny" (№ ад 10 лютага 1939 г.) паведамляў, што пасля паездкі заходнебеларускага дзеяча ў Латвію пражскія беларусы спынілі ўсе кантакты з "групай Дзямідава", а ўся карэспандэнцыя пачала накіроўвацца У. Пігулеўскага, які разглядаўся як правадыр латвійскіх беларусаў. На доказ гэтага прыводзіўся факт, што 11 сакавіка 1939 г. У. Пігулеўскі адзначыў свой дзень нараджэння, на які запрасіў шмат беларускіх настаўнікаў. Вячэра доўжылася да 6-й гадзіны раніцы, а за пачастунак імяніннік заплаціў грашыма, атрыманымі ад Я. Станкевіча. Польскія дыпламаты сцвярджалі, што ў прыватным ліставанні да Зэйдліна ў Коўне і Луцкевіча ў Вільні У. Пігулеўскі дае зразумець, што ён прадстаўляе ўвесь беларускі рух у Латвіі. З гэтай мэтай ён нават друкаваўся на старонках польскай прэсы, дзе пісаў пра беларускае жыццё ў Латвіі.

і Езавітаў тым часам, не разрываючы сувязі са сваімі прыхільнікамі, працуюць далей. Пігулеўскі па-ранейшаму вядзе сваю сацыял-дэмакратычную лінію і падтрымлівае сувязь з латышскімі сацыял-дэмакратамі, а таксама беларусамі ў Польшчы. Камунікуе, таксама, патаемна з Масквой, адкуль атрымлівае навуковыя кнігі і дысертацыі. Магчыма, што ў гэтым выпадку ў якасці пасрэдніка выступае Торгпредство ці Полпредство. Наведваюць яго таксама партыйныя таварышы, якія інструктуюць яго наступным чынам: 'Неабходна зараз займаць пазіцыю чакання; несумненна, ход гісторыі, якога ахвярамі будуць Польшча і Літва, дасць штуршок да далейшай барацьбы. Таму належыць толькі рыхтавацца, каб на тэрыторыі згаданых дзяржаў стварыць Беларускую рэспубліку. Дапаможа ў гэтым Савецкі Саюз, паколькі ён зацікаўлены, каб існавала буферная дзяржава, якая будзе абараняць Саветы ад польскай агрэсіі' (...) Пігулеўскі стварае вялікія клопаты латвійскім уладам. Лічыць сябе за сябру ген. Балодыса, які ведаў Пігулеўскага з часоў супольнае працы ў соймавых камісіях. Балодыс называе яго не інакш, як 'прохвост' і 'мерзавец'. Знаходзіцца аднак шмат легкаверных, якія вераць словам П.[ігулеўскага]. І так, напрыклад, Пігулеўскі нядаўна апавядаў, што латвійскі кабінет міністраў разглядае беларускае пытанне ў шырокім маштабе, уключна з магчымасцю вылучэння пэўных валасцей для будучай Беларусі. Вядома, аказалася, што гэтая тэма ніколі не закраналася на пасяджэнні Рады міністраў (...) У адрозненні ад Пігулеўскага, які займае пазіцыю чакання, Езавітаў намагаецца дзейнічаць больш актыўна. Ён усталёўвае кантакты з Менскам, а таксама з беларусамі ў Вільні, Горадні, Коўне, Празе і ў Амерыцы. Як пераканаты сацыяліст, Езавітаў спрытна выстаўляе на першы план у сваёй дзейнасці нацыянальны момант, дзякуючы чаму аб'ядноўвае вакол сябе частку прыхільнікаў Пігулеўскага. Ягоны заклік: усё дзеля Беларусі, незалежна ад таго, ці яна камуністычная, ці фашысцкая, ці нейкая іншая"[177]. Аўтары рапарту сцвярджалі, што пасля травеньскага пераварота ўлады ў Рызе не разглядалі ўсур'ёз беларускую меншасць, мяркуючы, што беларускай праблемы ў Латвіі як такой не існуе, а беларускі рух можна ліквідаваць, выкарыстоўваючы адміністрацыйныя сродкі[178].

Хоць згаданы рапарт утрымлівае каштоўныя звесткі (польская амбасада мела сярод беларускіх актывістаў уласную крыніцу інфармацыі), складана яго лічыць аб'ектыўным. У дакуменце знайшлі адлюстраванне тагачасныя польска-беларускія супярэчнасці і канфлікт інтарэсаў. Аналіз зместу дазваляе

[177] AAN, sygn. 477, t. 5328, Raport Poselstwa RP w Rydze, Raport dot. działalności białoruskiej na Łotwie, 12 lutego 1939 r.

[178] AAN, sygn. 477, t. 5328, Raport Poselstwa RP w Rydze, Raport dot. działalności białoruskiej na Łotwie, 12 lutego 1939 r.

сцвярджаць, што польскія дзеячы ў Рызе і Варшаве па-ранейшаму лічылі беларускі рух штучнай з'явай і вынікам нямецкіх або савецкіх інтрыг.

Тым часам, пад уплывам міжнародных падзей у 1939 г. У беларускіх дзеячаў узнікла думка склікаць III усебеларускую нацыянальна-палітычную канферэнцыю. У абмеркаванні гэтай ідэі ад латвійскіх беларусаў удзельнічаў К. Езавітаў[179]. Поспехі III Рэйха на міжнароднай арэне ў канцы 1930-х г. узмацнілі сярод беларускіх дзеячаў пранямецкія настроі і спадзяванне з дапамогай Нямеччыны стварыць незалежную дзяржаву. Пры гэтым належыць падкрэсліць, што стаўленне да нацыстаў было розным. Паслядоўных прыхільнікаў супрацоўніцтва з Берлінам, якія ў той ці іншай ступені падзялялі ідэалогію III Рэйха, была ўсяго жменька: група нацыянал-сацыялістаў на чале з Фабіянам Акінчыцам. Большасць тых беларускіх дзеячаў, хто наважыўся падтрымаць немцаў, кіравалася халодным палітычным разлікам, бо не бачыла альтэрнатывы ва ўмовах бягучай міжнароднай сітуацыі. Сведчыць аб гэтым факт, што супрацоўніцтва з Берлінам было вынікам працяглых унутраных дыскусій і ваганняў. У сваю чаргу нямецкая

---

[179] 8 траўня 1939 г. В. Захарка пісаў К. Езавітаву: "*Аднак (як бы там ні было, калі падзеі сапраўды пойдуць, та пайду з імі і я. Ахвотна аддаў бы гэтую ролю другому, але, на жаль, няма каму. Калі мы гаворым аб тым, хто будзе на чале, та гэта залежыць не ад адных толькі нас. У нас гэтае пытанне, на наша шчасце, стаіць добра, а як будзе ў украінцаў яшчэ няма ведама. Для контрагента ні паланафілы, ні русафілы, як і людзі хістаўшыеся, не датрымаўшыя сваёй цвёрдасцю на простай дарозе абсалютна непрыемлімы. Тут патрабуюцца людзі маралі і вялікай сілы волі. Гэта трэба помніць і з гэтым лічыцца, маючы на ўвазе, што на чале і пад чалом будуць стаяць не арганізацыі, а людзі вышэйазначанага сорту. Арганізацыі могуць і павінны быць, аглаўляць іх павінны людзі, якія здольнымі былі б не толькі складаць арганізацыі, але і працаваць пры перабудове так, як гэта ўжо паказаў вопыт. Хаця ўжо ні на адной мапе Беларусь не паказана як незалежная дзяржава, аднак калі і як пачнецца акцыя і як будзе настаўлена справа я яшчэ не ведаю. Украінцы ўжо маюць пачатак і ў гэтым іх шчасце і іх выгада. Зусім што іншае мы. Аднак трэба думаць, што пры падзеях і іх, і наша справа стануць агульнай акцыяй. Магчыма, што перад пачаткам яе, калі ўсё высветліцца, у пажаданым кірунку, та прыйдзецца склікаць канферэнцыю. У нас 'чэхаславаў' ужо адбылася 26-12-38. Яна, як і трэба было чакаць, дала адзін голас і адны думкі, нягледзячы на рознапартыйнасьць. Няма іншых поглядаў і ў іншых прыгнечаных народаў. Мы нават залажылі беларускі фонд*" (ГАРФ, ф. 5875, оп. 1, д. 11, л. 105). У адказ (2 чэрвеня 1939 г.) лідар латвійскіх беларусаў дзяліўся сваімі думкамі са старшынём Рады БНР: "*Ніякая нарада ня зробіць цуду, нават не дасць новых думак, а фактычна павінна быць выявіцелькай ужо гатовых думак і планаў, для прыйма якіх патрэбна не гучная нарада, а спатканне 5–6 чалавек. Спатканне такой групы ініцыятараў для ўзаемнае інфармацыі і абмену думак было б дужа карысна. Звярнуў я ягоную ўвагу і на тое, што месца нарады – таксама надзвычайна важнае пытанне: нарада там, дзе была 2-я нарада, можа быць дужа гучнай, але яна можа выклікаць розныя контрмеры для ўдзельнікаў яе і выкліча ўнутраную калатню паміж беларусамі; нараду ў Парыжу могуць і не дазволіць, бо пабачаць у ёй спробу аслабіць Польшчу зсярэдзіны, а ейнаю дужасцю зара даражаць больш, чым калі б тое было*" (ГАРФ, ф. 5875, оп. 1, д. 11, л. 471).

разведка цікавілася прадстаўнікамі "малых народаў", якіх можна было выкарыстаць у вайскова-палітычных мэтах падчас будучага канфлікту з Польшчай і СССР. Першымі пачалі шукаць кантактаў з III Рэйхам прадстаўнікі беларускага актыву Чэхіі і Польшчы. Следам мусілі пайсці дзеячы з Латвіі. Складана адказаць, калі адбыліся першыя кантакты з Берлінам. Паводле непацверджаных звестак, спроба нямецкіх вайсковых колаў усталяваць сувязь з лідарамі беларускага руху ў Латвіі адбылася яшчэ ў 1934 г.[180]

Кантактам паміж немцамі і латвійскімі беларусамі спрыяў Ойген фон Энгельхард, балтыйскі немец, што ў другой палове 1930-х гг. быў дарадцам па беларускіх справах у Замежным аддзеле НСДАП, якім кіраваў Альфрэд Розенберг[181]. Энгельхард напярэдадні II сусветнай вайны неаднаразова наведаў Латвію дзеля перамоў з беларусамі. Вядома, што ў 1938 г. немец двойчы сустракаўся з М. Дзямідавым і запрасіў яго наведаць Берлін[182]. Нямецка-беларускія кантакты рабіліся ўсё больш заўважнымі па меры набліжэння вайны. Можна меркаваць, што пытанне стаўлення да Германіі закраналася

---

[180] Падчас допытаў у турме НКГБ у 1940 г. М. Дзямідаў і У. Корці ўзгадалі Эдмунда Зуземіля з Кёнігсберга называючы яго "афіцэрам нямецкага Генштаба". Яны сцвярджалі, што ў 1934 г. ён накіраваў ліст лідару латвійскіх беларусаў, у якім пераконваў, што Германія будзе спрыяць беларускаму руху. Паводле слоў М. Дзямідава, К. Езавітаў лічыў неабходным па тактычных меркаваннях устрымацца ад кантактаў з немцамі (LVA, 1986 f., 2 apr., P-10551, 88–97 lpp., Пратакол вочнай стаўкі М. Дзямідава і В. Корці, 26 снежня 1940 г.). Тым часам, супрацоўнікі польскай амбасады ў Рызе адзначалі, што ў 1934 г. спробы скантактавацца з немцамі рабіў К. Езавітаў. Польскія крыніцы паведамлялі, што ён атрымаў нямецкія грошы з Гданьска, а ў 1935 г. шукаў сувязі з украінскай арганізацыяй "Просвіта", якая дзейнічала ў Германіі (AAN, sygn. 477, t. 5328, Raport Poselstwa RP w Rydze, Raport dot. działalności białoruskiej na Łotwie, 12 lutego 1939 r.). У абодвух выпадках інфармацыю не ўдалося пацвердзіць.

[181] Ойген фон Энгельхард добра ведаў латгальскіх беларусаў, бо нарадзіўся на Ілукшчыне. У сваёй працы *Беларусь: народ і краіна* ён згадваў, што ў дзяцінстве першымі яго сябрамі былі дзеці мясцовых беларускіх сялян (E. v. Engelhardt, *Weissruthenien: Volk und Land,* Berlin 1943, s. 9). Пашырыць веды пра беларусаў яму дапамаглі падзеі I сусветнай вайны, падчас якой немец апынуўся на ўсходзе Беларусі. У сярэдзіне 1930-х гг. ён пачаў выступаць у якасці эксперта па беларускіх справах. З 1935 г. Энгельхард супрацоўнічаў з берлінскім Інстытутам памежных і замежных немцаў. Як супрацоўнік гэтай установы напярэдадні нямецка-савецкай вайны ён падрыхтаваў некалькі прац аналітычных працу прысвечаных БССР і беларускаму народу. Энгельхард належаў да ліку нешматлікіх "беларусафілаў" сярод прадстаўнікоў нямецкіх інтэлектуальных эліт і выказваў погляд, што беларусы з'яўляюцца натуральнымі саюзнікамі III Рэйха, якіх немцы павінны падтрымліваць у імкненні да стварэння нацыянальнай дзяржаўнасці. Ён добра валодаў беларускай мовай – да такой ступені, што перакладаў беларускія творы. У 1949 г. намаганнямі Вітаўта Тумаша выйшаў яго пасмяротны пераклад на нямецкую мову вершаў Максіма Багдановіча (И. Баринов, *"Большой друг белорусского народа": Ойген фон Энгельгардт и его одиссея*, "Славянский альманах" 2020, № 1–2, с. 249–280).

[182] LVA, 1986 f., 2 apr., P-10551, 88–97 lpp.

і падчас вышэйзгаданай сустрэчы латвійскіх беларусаў з Я. Станкевічам. У чэрвені 1939 г. у Гданьску адбылася нарада беларускіх дзеячаў з розных краін, на якой прысутнічалі прадстаўнікі нямецкіх палітычных колаў і выведкі. Паводле непацверджаных звестак, у гэтай сустрэчы ўдзельнічалі К. Езавітаў і М. Дзямідаў. Вынікам нарады магла быць дэкларацыя, якая пацвярджала арыентацыю беларускіх дзеячаў на Берлін[183]. На дадзены момант складана пацвердзіць удзел у мерапрыемстве беларусаў з Латвіі. Некаторыя даследчыкі ставяць пад сумнеў і характар дынцыгскай нарады[184].

Тым часам не выклікаюць сумневу кантакты з немцамі, якія ўсталяваў М. Дзямідаў. Ён скарыстаўся запрашэннем праф. Энгельхарда і 8 ліпеня 1939 г. прыехаў у Берлін[185]. Афіцыйна паездка ў нямецкую сталіцу мела акадэмічны характар, а яе мэтай было чытанне лекцый пра беларускае адраджэнне. У рэальнасці М. Дзямідаў намагаўся завязаць супрацоўніцтва з тамтэйшымі прадстаўнікамі беларускага руху і нямецкімі дзяржаўнымі і вайсковымі ўстановамі, якія займаліся беларускімі пытаннямі. У прыватнасці М. Дзямідаў сустрэўся з Фабіянам Акінчыцам і Анатолем Шкуткам. Яны абмяркоўвалі пытанні пра магчымасць беларускіх паўгадзінных радыёперадач на хвалях нямецкага радыё, адкрыццё беларускага народнага ўніверсітэта ў Нямеччыне, уладкаванне беларускай моладзі ў нямецкія ВНУ. Падчас допытаў у савецкай турме М. Дзямідаў характарызаваў Ф. Акінчыца не найлепшым чынам: "*Падчас майго прыезду Акінчыц, сабраўшы разам Шкутку, мяне, Бароўскага спрабаваў гэтую сустрэчу і гэтую размову афарміць як афіцыйную нараду і нават спрабаваў пісаць пратакол, які я павінен быў падпісаць як прадстаўнік латвійскіх беларусаў, Бароўскі – як прадстаўнік эмігрантаў – беларусаў у Германіі, Шкутка – як прадстаўнік беларусаў у Польшчы, але з гэтай задумы нічога не выйшла, бо ўсе адмовіліся ад подпісу і ад пратакалавання. Я лічу, што гэты пратакол быў патрэбны Акінчыцу дзеля таго, каб перадаць яго нямецкім уладам з мэтай атрымання грошай*"[186]. Пры пасрэдніцтве берлінскіх беларусаў М. Дзямідаў сустрэўся з праф. Герхардам фон Мэндэ,

---

[183] У. Сакалоўскі, *Пачатак другой сусветнай вайны і беларуская эміграцыя (1938–1941)* [у:] *Беларусь і Германія. Гісторыя і сучаснасць*, Менск 2004, с. 176.

[184] На думку Юрыя Туронка ў Гданьску адбылася не нарада беларускага нацыянальнага актыву з розных краін, а сустрэча прадстаўнікоў НСДАП з групай беларускіх нацыянал-сацыялістаў на чале з Ф. Акінчыцам, які намагаўся надаць гэтай падзеі значэнне значна большае, чым яна мела ў сапраўднасці. J. Turonek, *Działalność grupy Fabiana Akinczyca (1939–1943)* [w:] *Białoruś w XX stuleciu w kręgu kultury i polityki*, red. D. Michaluk, Toruń, 2007, s. 400.

[185] У. Сакалоўскі, У. Ляхоўскі, *Нямеччына й беларускі нацыянальны рух напярэдадні й у першыя гады Другой Сусьветнай Вайны*, "Białoruskie Zeszyty Historyczne" 2000, z. 13, s. 10.

[186] LVA, 1986 f., 2 apr., P-10551, 88–97 lpp.

які з 1937 г. узначальваў беларускую секцыю ў Нямецкім інстытуце даследаванняў замежных праблем Берлінскага ўніверсітэта. На загад нямецкага кіраўніцтва гэты чалавек кантактаваў з беларускім нацыянальным актывам. Паводле пазнейшых сведчанняў М. Дзямідава, планавалася, таксама, яго сустрэча з А. Розенбергам, якая, аднак, не адбылася[187].

Імаверна, што падчас знаходжання М. Дзямідава ў Берліне Абвер даручыў яму вербаваць на выезд у Рэйх беларусаў – грамадзян польскай дзяржавы, якія знаходзіліся ў Латвіі на сезонных сельскагаспадарчых работах[188]. Нямецкі бок потым меў намер накіраваць іх у дыверсійныя школы і выкарыстаць падчас ваеннай кампаніі супраць Польшчы. Уяўленне пра місію М. Дзямідава даюць назіранні прадстаўнікоў польскага пасольства ў Рызе. У сярэдзіне ліпеня 1939 г. польскі вайсковы аташэ маёр Фелікс Бжэсквінскі інфармаваў польскае МЗС, што ў Латвіі адбываецца вярбоўка сезонных работнікаў на выезд у Нямеччыну. Паводле дыпламата, вярбовачнае бюро знаходзілася ў Рызе, у сядзібе Таварыства беларускіх настаўнікаў у Латвіі. У большасці завербаваныя былі маладыя мужчыны, якія адбылі тэрміновую службу ў польскім войску. Атрымаўшы нямецкія візы, яны меліся кіравацца ў Шчэцін, дзе іх сустрэне А. Шкутка. Пра вярбоўку ведала латвійская палітычная паліцыя, паколькі М. Дзямідаў інфармаваў У. Корці[189]. Пры гэтым ён пераконваў латышоў, што гэта беларускія студэнты, якія жадаюць вучыцца ў нямецкіх ВНУ. Немагчыма вызначыць, колькі беларусаў М. Дзямідаў здолеў завербаваць і накіраваць у III Рэйх. Пазней ён адзначаў, што ў 1939 г. удалося выслаць у Нямеччыну толькі 4 чал. Гэтыя людзі былі пералічаныя ў спісе з 20 асоб, падрыхтаваным паплечнікам Ф. Акінчыца Аляксандрам Крытам і перададзеным М. Дзямідаву – каб той дабіўся для іх дазволу на выезд за мяжу ад латвійскіх улад[190]. Тым часам, польскі вайсковы аташэ сцвярджаў, што 15 ліпеня 1939 г. у Нямеччыну выехала 20 асоб, а колькасць усіх завербаваных складала каля 1 тыс.[191]

Імаверна, колькасць тых, хто выехаў, магла быць большай, калі б не крокі польскага пасольства ў Рызе. У ліпені 1939 г. у консульства звярнуўся сезонны работнік Язэп Пальчух, які заплаціў М. Дзямідаву 20 латаў за афармленне яго выезду з сям'ёй (жонкай і сынам) у Нямеччыну. Насуперак парадам М. Дзямідава, работнік паінфармаваў польскае консульства пра свае планы, запэўніваючы, што едзе ў Рэйх на сезонную працу, паколькі даведаўся ад сваяка, што там лепшыя заробкі. Акрамя таго, ён паінфармаваў

---

187 LVA, 1986 f., 2 apr., P-10551, 88–97 lpp.

188 У. Сакалоўскі, У. Ляхоўскі, *Нямеччына й беларускі нацыянальны…*, с. 10.

189 AAN, sygn.: MSZ, t. 357, k. 414–415.

190 LVA, 1986 f., 2 apr., P-10551, 88–97 lpp.

191 AAN, sygn.: MSZ, t. 357, k. 414.

дыпламатаў пра час і спосаб выезду. Польскія ўлады вырашылі гэта прадухіліць. Па просьбе амбасады латвійскія ўлады затрымалі ў Рыжскім порце карабель, на якім была група завербаваных[192]. Невядома як склалася жыццё тых, каму ўдалося выехаць у Нямеччыну. На падставе захаваных крыніц магчыма прасачыць лёс толькі адзінак. Так, беларус з Ашмяншчыны Браніслаў Даніловіч пазней уступіў у беларускую дыверсійную адзінку Абвера (т. зв. 1-ы Беларускі штурмавы звяз). Дзякуючы намаганням праф. Г. Мэндэ, у 1939 г. нямецкі бок прызначыў шэраг стыпендый для беларускай моладзі ў Берлінскай політэхніцы. Магчыма, туды трапілі некаторыя эмігранты, завербаваныя М. Дзямідавым[193].

Варта задумацца, чым кіраваўся беларускі дзеяч, беручы ўдзел у авантурнай акцыі немцаў. Не апошнюю ролю, відаць, адыграла матэрыяльная карысць: завербаваныя плацілі М. Дзямідаву за пасрэдніцтва і афармленне дакументаў. Ведаючы схільнасць М. Дзямідава да фінансавых злоўжыванняў, можна меркаваць, што менавіта гэты чыннік прадвызначыў яго ўдзел у вярбоўцы.

Кастусь Езавітаў усталяваў кантакты з берлінскімі беларусамі пасля пачатку ІІ сусветнай вайны. Праўда, яны абмяжоўваліся супрацай з рэдакцыяй газеты "Раніца". Латвійскі беларус рупіўся пра распаўсюд гэтага перыёдыка сярод беларусаў Латвіі, сам друкаваўся на старонках берлінскага выдання. Нярэдка ён падпісваў свае артыкулы псеўданімам "М. Зінук"[194]. 31 траўня 1940 г. ён ахвяраваў 16 кніг з уласнага кнігазбору беларусам – польскім вайскоўцам, якія апынуліся ў нямецкім палоне[195]. Сябра Беларускага прадстаўніцтва Анатоль Шкутка пісаў да К. Езавітава (26 чэрвеня 1940 г.): "*Вашыя пісьмы, апошні з Нікіфароўскім, і пачку з кніжкамі атрымаў. Дзякую Вам. Кніжкі разасланы сярод палонных, і ад імя іх прыношу Вам яшчэ раз самую шчырую падзяку. Трэба было бачыць радасць гэтых нашых слаўных мілых жаўнераў, якіх лёс закінуў на зусім чужы для іх грунт. Яны, мне так здаецца, яшчэ ніколі так як цяпер, пачалі любіць свой край. Будучы ўдома, на Беларусі, не цанілі яе. Сёння, здалёк ад родных палеткаў, бачыцца Яна ў зусім іншых фарбах: родных, завучых і вабячых*"[196]. Анатоль Шкутка прасіў яшчэ дасылаць кнігі, але рабіць гэта праз Міжнародны Чырвоны Крыж, а таксама інфармаваў К. Езавітава пра планы стварэння культурна-асветнай арганіза-

[192] AAN, MSZ, t. 11605, Protokół zeznania Józefa Palczucha, 17 VII 1939, k. 42.

[193] AAN, sygn. 477, t. 5328. K. 50.

[194] А. Вабішчэвіч, *"Але ж шлях да свабоды старонка праложа!"* [у:] *Сыны і пасынкі Беларусі*, рэд. С. Барыс, Менск 1996, с. 340.

[195] Сярод іх была кніга Ф. Багушэвіча *Смык беларускі* (Коўна 1922) і Ф. Аляхновіча *У лясным гушчары* (Рыга 1932), а таксама выданні, прысвечаныя латвійскім беларусам. НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 7, л. 29.

[196] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 51, л. 41.

цыі беларусаў у Нямеччыне (“Саюзу Беларусоў у Нямеччыне”)[197]. Адначасова ён цікавіўся станам беларускай справы ў Латвіі і настроямі ў краіне[198].

Напярэдадні і на пачатку ІІ сусветнай вайны адбыліся змены ў арганізацыйным жыцці латвійскіх беларусаў. У сувязі са зменамі заканадаўства аб грамадскіх арганізацыях, кіраўніцтва Таварыства беларускіх настаўнікаў у Латвіі мусіла перарэгістраваць арганізацыю пад новай назвай, іначай ТБНЛ апынулася б пад пагрозай закрыцця[199]. На пасяджэнні 9 лістапада 1938 г. было вырашана ператварыць ТБНЛ у Таварыства беларусаў у Латвіі (ТБЛ) (*Latvijas baltkrievu biedrība*), а таксама вырашана накіраваць да прэзідэнта краіны дэлегацыю, каб высветліць стаўленне ўлад да беларускай нацыянальна-культурнай справы[200]. На чарговым пасяджэнні кіраўніцтва таварыства (№ 10 ад 7 снежня 1938 г.) рэгістрацыя новай арганізацыі была даручана М. Дзямідаву[201]. 9 лютага 1939 г. у Рызе адбыўся агульны сход ТБНЛ, у якім узяло ўдзел 17 чалавек. Прысутныя прынялі рашэнне пра перарэгістрацыю сяброў, а таксама абралі новае кіраўніцтва (М. Дзямідаў – старшыня, А. Родзька – намеснік старшыні і сакратар, К. Мяжэцкі – скарбнік, Марыя Даль – 2-гі сакратар, Сцяпан Рамаш – сябра) і рэвізійная камісія (Я. Камаржынскі – старшыня, Надзея Юзафовіч і Раіса Іванова – сябры)[202]. На першым пасяджэнні новага кіраўніцтва 22 лютага было вырашана ўзнавіць чытанне публічных лекцый і зладзіць 15 красавіка Дзень белару-

---

[197] У лісце А. Шкуткі чытаем: “*На вёсках немцы часта не разрожніваюць беларуса да паляка, а дзеля таго, што палякаў ніколі тут не любілі, то і адносіны да іх былі не надта сімпатычныя. Не маючы паняцця аб беларусах, такі сабе Мюлер ці Шмідт, бачачы на палонным польскі мундур, лічыць яго за паляка. Каб гэтай справе дапамагчы і то не толькі палонным але і наогул усім беларусам, жывучым у Нямеччыне, паўстала ў мяне (...) думка выдання ім адпаведных легітымацый, якія б былі праўным дакументам і перад нямецкімі ўладамі (...) Сёння маем у Берліне ‘Беларускае Прадстаўніцтва ў Нямеччыне’, якое вось і пераймае функцыі палагоджання праўных патрэбаў беларусаў перад нямецкаю ўладаю. Паўстанне гэтае ўстановы, на маю думку, трэба павітаць. Па-першае, будзем мець змогу правесці афіцыйную перапісь усіх беларусаў у Нямеччыне. Другое, даць ім адпаведны дакумент, з якога б было відаць, што гэта беларус і гэтым адрожніць яго раз назаўсёды ад паляка ці маскаля. Трэцяе, маючы гэтых людзей, старацца для іх перад нямецкімі ўладамі аб працы, іхніх правах і г.д. Чацвёртае, выступаць як прызнаная нямецкаю дзяржаваю арганізацыя. Думаю, што вось у гэтакі спосаб ставячы нашую нацыянальную працу, памылкі не раблю. Хацелася б чуць Вашую думку*”. НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 51, л. 42.

[198] Аўтар пісаў К. Езавітаву: “*Які настрой пануе цяпер у Латвіі? Я маю ўражанне, што трэба было б ужо думаць аб больш пэўным месцы для нашых грамадзян. Калі зойдзе патрэба, пішыце адразу ж мне*”. НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 51, л. 42.

[199] LVVA, 3235 f., 5 apr., 1919 l., 9 lp.

[200] LVVA, 2924 f., 1 apr., 2 l., 30 lp.

[201] LVVA, 2924 f., 1 apr., 2 l., 34 lp.

[202] LVVA, 3235 f., 5 apr., 1617 l., 15 lp.; LVVA, 2924 f., 1 apr., 3 l., 1–5 lpp.

скай культуры[203].

14 лютага 1939 г. А. Родзька перадаў у МУС заяву аб рэгістрацыі Таварыства беларусаў у Латвіі, а 29 чэрвеня 1939 г. міністэрства зацвердзіла статут новай арганізацыі. Згодна з ім, да арганізацыі мог належыць кожны дарослы латвійскі грамадзянін беларускай нацыянальнасці[204]. Таварыства афіцыйна пачала дзейнічаць са жніўня 1939 г. Адначасова спыніла існаванне ТБНЛ: 7 чэрвеня 1939 г. адбылося апошняе (27-е) пасяджэнне ўправы, а ўжо наступны сход (22 жніўня) лічыўся 1-м пасяджэннем Часовай управы Таварыства беларусаў у Латвіі (кіраўнік А. Родзька). У перыяд з 22 жніўня па 29 кастрычніка 1939 г. адбылося шэсць пасяджэнняў часовага кіраўніцтва[205].

29 кастрычніка 1939 г. быў скліканы 1-шы агульны сход сяброў ТБЛ, на якім старшынём арганізацыі быў абраны П. Мірановіч. У склад управы ТБЛ увайшлі: П. Мірановіч (старшыня), С. Сахараў (намеснік), М. Краўчанка (сакратар), Эмануіл Сангайла-Станевіч (скарбнік), Данат Зорыньш (сябра). Склад новай Рэвізійнай камісіі быў наступны: Я. Камаржынскі (старшыня), Я. Каяла (сакратар) і К. Казакевіч[206]. На прапанову У. Пігулеўскага ўдзельнікі прынялі рэзалюцыю, у якой канстатавалася, што правы беларускай меншасці не рэалізуюцца: 1) у галіне асветы, бо на 26 тыс. беларусаў у Латвіі існуе толькі адна беларуская школа, 2) у грамадскай галіне, бо ў валасцях з перавагай беларускага насельніцтва органы самакіравання складаюцца не з беларусаў, а беларуская інтэлігенцыя нават з вышэйшай адукацыяй не можа знайсці сабе годную працу. Сход упаўнаважыў новую ўправу патрабаваць ад ураду: 1) адкрыцця беларускіх школ, якія працавалі ў 1929/30 гг., 2) прадстаўлення беларусам месцаў у мясцовай адміністрацыі, 3) роўнага стаўлення да беларусаў падчас атрымання працы[207].

Пасяджэнні ўправы ТБЛ адбываліся рэгулярна: не радзей за адзін ці два разы на месяц. У перыяд з 29 кастрычніка 1939 па 10 снежня 1940 гг. адбылося 14 пасяджэнняў управы. Асабліва інтэнсіўна ўправа працавала ў лістападзе 1939 г. Апрача таго, за гэты час былі скліканыя чатыры сходы (тры агульныя і адзін надзвычайны)[208]. Праўда, удзельнікаў было няшмат[209].

Стрыжань ТБЛ складаў былы актыў ТБНЛ. 27 верасня 1939 г. у склад арга-

---

[203] LVVA, 2924 f., 1 apr., 3 l., 6–7 lpp.

[204] LVVA, 2924 f., 1 apr., 6 l., 6 lp.; LVVA, 3235 f., 5 apr., 1617 l., 10 lp.

[205] LVVA, 2924 f., 1 apr., 3 l., 13 lp.

[206] LVVA, 3235 f., 5 apr., 1617 l., 2 lp.

[207] LVVA, 2924 f., 1 apr., 3 l., 22 lp.

[208] LVVA, 2924 f., 1 apr., 4 l.; LVVA, 2924 f., 1 apr., 5 l.

[209] Першы сход сябраў адбыўся 21 красавіка 1940 г. пад старшынствам К. Езавітава. У мерапрыемстве ўзяло ўдзел 23 чал. На другім сходзе 2 чэрвеня 1940 г. прысутнічала ўсяго 12 чал.

нізацыі былі прынятыя новыя сябры, у тым ліку Н. Пінская і У. Пігулеўскі[210]. У 1939 г. у Рыгу вярнуўся К. Езавітаў, які таксама далучыўся да Таварыства беларусаў у Латвіі[211]. Улетку 1939 г. у шэрагах арганізацыі налічвалася 70 сяброў, у тым ліку – Я. Камаржынскі, К. Езавітаў, У. Пігулеўскі, С. Сахараў, П. Мірановіч, Д. Мяжэцкі, Я. Клагіш, Н. Пінская, М. Панькоў, М. Краўчанка, М. Грыгаровіч і інш. Такім чынам, нягледзячы на нешматлікасць, ТБЛ аб'ядноўвала найбольш актыўных нацыянальных дзеячаў. Сярод сяброў таварыства не было, аднак, М. Дзямідава, які пасля сыходу з пасады кіраўніка ТБНЛ часова пакінуў Латвію[212].

Новая арганізацыя змагалася з фінансавымі цяжкасцямі. 18 кастрычніка 1939 г. пасаду часовага старшыні ўправы пакінуў А. Родзька, спаслаўшыся на тое, што "каса таварыства зусім пустая"[213]. ТБЛ лічылася спадкаемцам ТБНЛ і пераняло сродкі, якія засталіся ад папярэдніцы, атрымаўшы 7 студзеня 1939 г. 1569 латаў[214]. Крыніцы дазваляюць меркаваць, што прынамсі частка фінансаў ТБНЛ не трапіла ў ТБЛ, бо М. Дзямідаў прыўлашчыў гэтыя грошы. У лістападзе 1939 г. і студзені 1940 г. старшыня П. Мірановіч неаднаразова звяртаўся да М. Дзямідава з просьбай перадаць новай арганізацыі ўсе справы і маёмасць ТБВЛ, у тым ліку стыпендыйны фонд, які раней існаваў пры Беларускім школьным аддзеле, а пасля яго ліквідацыі трапіў у рукі М. Дзямідава[215]. На сходзе сяброў ТБЛ 21 красавіка 1940 г. У. Пігулеўскі агучыў даклад пра стан сродкаў колішняга стыпендыйнага фонду БША, атрыманых з управы ТБНЛ. У. Пігулеўскі сцвярджаў, што частка грошай бясследна знікла[216]. Была створана рэвізійная камісія (У. Пігулеўскі, К. Езавітаў, Язэп Кукель) для вывучэння фінансавай сітуацыі ТБНЛ напярэдадні пераўтварэння ў Таварыства беларусаў у Латвіі. Камісія знайшла недакладнасці ў бухгалтэрыі ТБНЛ, за якую быў адказны М. Дзямідаў. Ён дапусціў злоўжыванні падчас рэгістрацыі сродкаў (вяртання пазык), атрыманых ад стыпендыятаў, і прыбытку з культурных мерапрыемстваў[217]. Камісія зрабіла выснову, што М. Дзямідаў незаконна захапіў частку грошай ТБНЛ[218]. М. Дзямідаў, у сваю чаргу, лічыў абвінавачанні беспадстаўнымі. 11 ліпеня 1940 г. у лісце П. Мірановічу ён пісаў, што збіраецца прыехаць у Рыгу, каб высветліць непаразуменне, і прасіў вызначыць час і месца сустрэчы ў пры-

[210] LVVA, 2924 f., 1 apr., 3 l., 13 lp.
[211] К. Езавітаў, *Кароткі жыццяпіс і праходжаньне службы*, с. 192.
[212] LVVA, 2924 f., 1 apr., 7 l., 1–6 lpp.
[213] LVVA, 2924 f., 1 apr., 9 l., 5 lp.
[214] LVVA, 2924 f., 1 apr., 8 l., 3 lp.
[215] LVVA, 2924 f., 1 apr., 9 l., 13б 20 lpp.
[216] LVVA, 2924 f., 1 apr., 4 l., 7–9, 11–12 lpp.
[217] LVVA, 2924 f., 1 apr., 9 l., 42–53 lpp.
[218] LVVA, 2924 f., 1 apr., 5 l., 1–11 lpp.

сутнасці сведкаў. Аднак у Рыгу былы кіраўнік ТБНЛ так і не прыехаў[219].

Нягледзячы на матэрыяльныя цяжкасці, ТБЛ распачало актыўную дзейнасць. Кіраўніцтва арганізацыі прыкладала намаганні, каб ажывіць нацыянальна-культурную працу латвійскіх беларусаў. На першым пасяджэнні ўправы (1 лістапада 1939 г.) было прынята рашэнне стварыць тэатральна-харавую секцыю пад кіраўніцтвам Я. Камаржынскага. А паколькі замежная прэса мала асвятляла жыццё латвійскіх беларусаў, кіраўніцтва ТБЛ вырашыла пачаць выданне часопіса. Як пісаў К. Езавітаў, "*адсутнасць свае прэсы ў Латвіі моцна дзейнічае на псіхіку кожнага свядомага беларуса, ствараючы настроі прыгнечанасці і агульнае расцярушанасці*". Планавалася, што выданне будзе выходзіць два разы на месяц. Выдаўцом перыёдыка меўся стаць П. Мірановіч, а рэдактарам Дамінік Мяжэцкі. У межах падрыхтоўкі праводзілася падпіска, каб выданне было самаакупным[220]. У снежні 1939 г. беларускі актыў звярнуўся да МУС з просьбай дазволіць выхад часопіса "Роднае слова"[221]. 1 студзеня 1940 г. С. Сахараў пісаў К. Езавітаву, што беларусы чакаюць дазволу на выданне, таму прасіў грамадскасць дасылаць матэрыялы[222]. Але адпаведнай згоды МУС не даў і задума засталася ў сферы планаў[223].

Больш удалай была дзейнасць па арганізацыі публічных лекцый. У Рызе і ў правінцыі ТБЛ ладзіла вечарыны і сустрэчы. 17 сакавіка 1940 г. у сталіцы прайшла сустрэча, прымеркаваная да 100-годдзя нараджэння Ф. Багушэвіча. К. Езавітаў прачытаў лекцыю *100-годдзе нараджэньня Францішка Багушэвіча і ягонае значэньне ў беларускім адраджэньні*. 31 сакавіка 1940 г. С. Сахараў азнаёміў слухачом з рэфератам па тэме *40-я ўгодкі сьмерці Паўла Шэйна і яго праца над зьбіраньнем беларускага фальклору*. 21 красавіка Казімір Мяжэцкі прачыў даклад *Роля сельскае гаспадаркі ў дзяржаўным жыцьці*[224]. 4 траўня 1940 г. ТБЛ зладзіла вечарыну з удзелам Н. Нікалаевай-Комісар і В. Бароўскай-Пігулеўскай, а таксама паказ вадэвілю Мікалаевай-Комісар (рэжысёр Я. Камаржынскі), у якім гралі: Я. Каяла, Л. Тэтар, Часлава Чэкстэрс, Я. Кукель і Д. Зорыньш. Мерапрыемства прынесла значны прыбытак арганізацыі[225]. 2 чэрвеня 1940 г., падчас 2-га агульнага схода Таварыства беларусаў у Латвіі, К. Езавітаў прачытаў рэферат *М.Я. Нікіфароўскі і яго значэньне для беларускай*

---

[219] LVVA, 2924 f., 1 apr., 9 l., 62 lp.

[220] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 48, л. 31.

[221] Э. Екабсонс, *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [в:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 58.

[222] HU, Калекцыя К. Езавітава, Ліст С. Сахарава да К. Езавітава, 1 I 1940 г.

[223] LVVA, 2924 f., apr. 1, 4 lieta, lpp. 7–9, 11–12.

[224] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 94, л. 4.

[225] LVVA, 2924 f., 1 apr., 4 l., 13–14 lpp.

навукі і ў беларускім адраджэнчым руху[226]. Праграма кожнага культурнага мерапрыемства мусіла ўзгадняцца з палітычнай паліцыяй. Напрыклад, 25 красавіка 1939 г. палітычнае ўпраўленне дазволіла пастаноўку п'есы *Паўлінка* падчас вечарыны 6 траўня[227]. 20 красавіка 1940 г. паліцыя інфармавала, што не мае пярэчанняў супраць пастаноўкі п'есы *Міхалка* і выканання твораў *Сасонка* і *Ай, ты, белая бяроза* падчас вечарыны 4 траўня[228].

Арганізацыя займалася таксама выдавецкай працай. Выйшаўшы на пенсію, С. Сахараў апрацаваў этнаграфічны матэрыял, сабраны сябрамі БНКТЛ і вучнямі Даўгаўпілскай беларускай гімназіі, дадаўшы значную колькасць народных твораў, запісаных ім на Краслаўшчыне ў 1935–1936 гг. У выніку ў 1937–1939 гг. ён падрыхтаваў рукапіс *Народная творчасьць Латгальскага беларуса (сабраная вучнямі Даўгаўпілскай і Лудзенскай дзяржаўных беларускіх гімназій і беларускім вучыцельствам пад кіраўніцтвам і бліжэйшым удзеле былога дырэктара Даўгаўпілскай беларускай гімназіі С.П. Сахарава)*. У 1939 г. С. Сахараў прадставіў на разгляд Культурнага фонду Латвіі каля 1 100 фальклорных запісаў розных жанраў. За атрыманую прэмію ў памеры 700 латаў улетку 1940 г. ТБЛ выдала 1-шы том *Народнай творчасьці латгальскіх і ілукстэнскіх беларусаў*, у які ўвайшло 414 песень[229]. Выданне мела грунтоўны навуковы апарат, да некаторых песняў далучаліся ноты і фота спевакоў. Кожны раздзел пачынаўся з прадмовы С. Сахарава[230]. Кніга была выдадзеная дзякуючы дапамозе кіраўніка фальклорнай камісіі Культурнага фонду, прафесара Карла Страўберга[231]. З ініцыятывы Таварыства беларусаў у Латвіі рэдактарам выдання стаў К. Езавітаў. З гэтай мэтай улетку і восенню 1940 г. ён быў камандзіраваны ў Латгалію[232].

Падсумоўваючы, можна зрабіць выснову, што нават пасля травеньскага пераварота і ўсталявання ў Латвіі аўтарытарнага кіравання беларуская меншасць мела магчымасці для нацыянальна-культурнай працы. Умовай было захаванне лаяльнасці да новых улад, што беларускія дзеячы добра разумелі. У *Беларускім календары* на 1937 г. чытаем: "*Ніхто не патрабуе аб*

---

[226] LVVA, 2924 f., 1 apr., 4 l., 17 lp.

[227] LVVA, 3235 f., 5 apr., 1619 l., 10 lp.

[228] LVVA, 3235 f., 5 apr., 1617 l., 6 lp.

[229] С. Сахараў, *Народная творчасць латгальскіх і ілукстэнскіх беларусаў*, Рыга 1940; М. Ліс, *Педагагічная і культурна-асветніцкая дзейнасць С.П. Сахарава*, "Весці Акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук" 1995, № 3, с. 104; Яна ж, *Сяргей Сахараў і беларуска-балцкія сувязі*, "Кантакты і дыялогі" 1996, № 10, с. 16–20.

[230] А. Чарняўскі, *Выдавецкая дзейнасць беларускай нацыянальнай меншасці ў міжваеннай латвіі (1918–1940 гг.)*, "Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Серыя 1. Гісторыя і археалогія. Філасофія. Паліталогія" 2023, т. 15, № 3, с. 66.

[231] Н. Голубева, *Беларусы ў Латвіі* [у:] *Беларускае замежжа*, рэд. Н. Голубева, Менск 2010, с. 197.

[232] LVVA, 2924 f., 1apr., 9 l., 55 lp.

нас, латвійскіх беларусаў, каб мы адракаліся ад свайго нацыянальнага 'я', каб мы адракаліся ад сваёй мовы, ад сваёй песні, ад сваіх звычаяў, ад усяго свайго роднага (...) Адроджаная Латвія не забараняе беларусам культурнай працы, напр. паставіць беларускі спектакль, наладзіць свой хор, выдаць сваю часопісь ці календар і г.д. Паглядзіце, беларусы, навокал: усе меншасці Латвіі – велікарусы, немцы, палякі, ліцвіны, жыды і зараз па меры іх сіл і сродак маюць свае арганізацыі, маюць свае газеты і часопісі, ладзяць свае тэатральныя пастаноўкі, лекцыі, святкаванні і г.д. Толькі ў сваёй агульнай і культурна-нацыянальнай працы мы павінны кіравацца словамі прэзідэнта д-ра К. Ульманіса 'Кожны ў сваёй працы, а ўсе ў працы дзяржаўнай' (...) А гэта значa, што кожны з нас, беларусаў, хто б ён ні быў (...) заўсёды павінен сваю працу згаджаць з карысцю нашай Латвійскай дзяржавы, у якой мы жывём, працуем і благамі якой карыстаемся"[233]. Аднак выкарыстоўваць гэтыя магчымасці на поўную моц беларускай меншасці перашкаджалі два чыннікі: 1) адсутнасць нацыянальная дзяржавы, якая магла падтрымліваць суайчыннікаў у Латвіі і 2) адсутнасць саліднай эканамічнай базы.

Належыць адзначыць, што беларусаў у Латвіі наўпрост не закрануў пачатак II сусветнай вайны. Латвія ў вераснёўскія дні 1939 года засталася на ўзбочыне ўзброенага катаклізму, які разыграўся зусім побач, за паўднёвай мяжой краіны. Не захаваліся крыніцы, якія б дазволілі падрабязна прасачыць рэакцыю беларускага актыву на падзеі ў Польшчы. Можна, аднак, сцвярджаць, што праведзенае рукамі Сталіна "ўз'яднанне" Заходняй Беларусі з БССР кіраўнікі беларускага руху ў Латвіі не сустрэлі варожа. Сведчыць аб гэтым факт, што беларускія дзеячы ў іншых краінах лічылі гэтыя падзеі карыснымі для беларускай справы.

Змены на палітычнай мапе пасля пакта Молатава – Рыбентропа, паўплывалі на лёс тысяч заходнебеларускіх сялян, якія на момант пачатку вайны знаходзіліся ў Латвіі на сезонных работах. Паводле звестак Латвійскай сельскагаспадарчай палаты, на 1 верасня 1939 г. у Латвіі працавала 38 337 замежных работнікаў, у тым ліку 27 786 польскіх грамадзян. Паступова іх колькасць змяншалася за кошт выезду на радзіму[234]. Найбольшая хваля вяртання назіралася восенню 1939 г., разам з заканчэннем рабочага сезону і працоўных кантрактаў. Паводле звестак МЗС Латвіі, увосень 1939 г. краіну пакінула 9,5 тыс., з іх 8 тыс. складалі жыхары Заходняй Беларусі[235].

Мігранты ехалі ў новую краіну, бо тае, з якой яны выехалі на працу ў Латвію, ужо не існавала. Вяртанне адбывалася праз пасрэдніцтва савецкай

---

[233] *Беларускі календар. 1937 г.*, скл. С. Сахараў, Daugavpils 1936, с. 44.

[234] LVVA, 1676 f., 1 apr., 41 l., 679 lpp.

[235] J. Grzybowski, *Emigracja zarobkowa z Polski na Łotwę i do Estonii w latach 1928–1939*, Warszawa 2021, s. 316.

дыпламатычнай службы. Уяўленне пра гэты працэс дае заходнебеларуская прэса. 29 снежня 1939 г. карэспандэнт віленскай газеты "Крыніца" пісаў: "*Цяпер, у звязку з чуткам аб тым, што ў Заходняй Беларусі даюць зямлю і што будзе праца на новых фабрыках і заводах, распачаўся вялікі рух павароту на бацькаўшчыну. Блізу па два-тры разы ў дзень адыходзяць з Рыгі на Дрысу – Полацак цэлыя эшалоны па 500 – 800 чалавек у кожным. Едуць стомленыя, але ўсхваляваныя і радасныя. Задоўга да цягніка станцыя ўжо забіта клункамі, скрынкамі, пакетамі. Хлопцы і дзяўчаты, а паміж імі трапляюцца і сталыя мужчыны і жанчыны, абгаварваюць зробленыя пакупкі. Блізу ніхто не вязець дамоў зароблены грошы, як гэта было ў мінулыя гады, калі латвійскія грошы магчыма было па цвёрдым курсе мяняць на злотыя. Цяпер усе купляюць вопратку, боты, а ў каго грошы больш, дык і веласіпеды, і кравецкія машынкі, гадзіннікі ды інш. найбольш кідаюцца ў вочы веласіпеды, якіх на 500 чалавек абавязкова вязуць не менш 400 штук і адміністрацыі прыходзіцца прычэпліваць да эшалону асобныя таварныя вагоны спецыяльна для веласіпедаў. Ад'езд беларускае працоўнае сілы ставіць Латвію цяпер у даволі цяжкі стан і ўрад ужо загадзя абгаварвае пытанне аб тым, якім спосабам у наступаючую вясну і лета замяніць выехаўшых беларусаў на сельскагаспадарчых працах*"[236].

Асноўная маса мігрантаў вярталася на радзіму, кіруючыся побытавымі меркаваннямі: на бацькаўшчыне людзі пакінулі сем'і і сваякоў. Большасць з аптымізмам глядзела ў будучыню, а вераснёўскія падзеі на радзіме давалі ім надзею на лепшыя ўмовы жыцця і працы. Спадзяванні ўзмацняла няведанне сутнасці камуністычнага ладу і савецкая прапаганда, якая малявала "Краіну саветаў" як рай на зямлі для працоўных. Весткі з бацькаўшчыны пра падзел абшарніцкай і царкоўнай зямлі на карысць бедных выклікалі энтузіязм сярод мігрантаў і схілялі да думкі вяртацца дадому[237].

Аднак частка сезонных работнікаў вырашыла застацца ў Латвіі. Няма адпаведных крыніц, каб вызначыць іх дакладную колькасць. Ускосныя звесткі дазваляюць меркаваць, што іх лічба была значнай – прынамсі, не меншай за колькасць тых, хто ў 1939–1940 гг. пажадаў вярнуцца да дому. Не вярталіся на радзіму перадусім тыя, хто меў у Латвіі сем'і і сталых працадаўцаў[238]. Праз адасобленасць сезонных мігрантаў ад мясцовых беларусаў, выезд першых з Латвіі не паўплываў на беларускае нацыянальна-культурнае жыццё ў гэтай краіне.

---

[236] Kor-t, *Biełaruskija sezonnyja rabotniki viartajucca u Zachodniuju Biełaruś*, "Krynica" 1939, № 12, s. 2.

[237] J. Grzybowski, *Emigracja zarobkowa z Polski na Łotwę i do Estonii w latach 1928–1939*, Warszawa 2021, s. 317–318.

[238] J. Grzybowski, *Emigracja zarobkowa z Polski na Łotwę i do Estonii w latach 1928–1939*, Warszawa 2021, s. 320–321.

Заканчэнне

Гісторыя беларусаў у Латвійскай Рэспубліцы ў 1918–1940 гг. з'яўляецца вельмі істотнай старонкай беларуска-латвійскіх адносін, які збліжае абодва народы і дэманструе падабенства іх лёсаў. Беларускі нацыянальна-культурны рух у Латвіі належыць разглядаць у кантэксце ўсяго Беларускага Адраджэння. З'яўленне беларускай ідэнтычнасці ў Латвіі было праявай агульнага працэсу фарміравання беларускай нацыянальнай свядомасці, якая фарміравалася на пачатку XX стагоддзя. Перадумовай нараджэння беларускай тоеснасці ў гэтай краіне было з'яўленне ў выніку складаных этнакультурных працэсаў на пераломе XIX і XX ст. беларускамоўнага насельніцтва на латвійска-беларускім памежжы – у Латгаліі. Беларускамоўнае жыхарства Латагаліі па пачатку XX ст. знаходзілася на этапе трансфармацыі сваёй свядомасці, калі культурная адметнасць і пачуццё сувязі з рэгіёнам ператвараліся ў пачуццё прыналежнасці да народу. Каталізатарам мясцовай беларускасці быў беларускі нацыянальны актыў (арганізацыі, школы), які ва ўмовах адсутнасці беларускай нацыянальнай дзяржавы выконваў ролю народатворчую. Пры гэтым пачынальнікамі мясцовага беларускага нацыянальна-культурнага жыцця былі дзеячы, якія не паходзілі з Латвіі. У дарэвалюцыйны перыяд яны па розных прычынах апынуліся на латвійскай зямлі. Не апошнюю ролю ў гэтым адыграла прыналежнасць Латгаліі да Віцебскай губерні. У першую чаргу гэта тычыцца настаўнікаў, якія службова былі накіраваны ў латгальскія паветы гэтай губерніі. Беларускае адраджэнне ў Латвіі было магчыма дзякуючы з'яўленню ў 1918 г. незалежнай латвійскай дзяржавы, якое стварыла юрыдычныя і практычныя ўмовы свабоднага развіцця нацыянальных меншасцей, у тым ліку беларусаў. Сапраўдным штуршком да ўзнікнення беларускай нацыянальна-культурнай працы ў Латвіі стала прыбыццё

ў Латвію дзеячаў БНР восенню 1919 г. Адкрыццё Вайскова-дыпламатычнай місіі і консульства БНР сталі пачаткам беларуска-латвійскага супрацоўніцтва ў палітычнай і культурнай галінах. Адначасова былі гэта першыя беларускія арганізацыі ў Латвіі, якія паклалі падмурак пад будучую нацыянальна-культурную працу беларусаў у гэтай краіне.

Пасля Рыжскага міру латвійская дзяржава стала адным з месцаў Еўропы, дзе знайшла прытулак жменька колішніх дзеячаў БНР. Менавіта гэтыя людзі як найбольш загартаваны ў нацыянальным сэнсе элемент распачалі арганізацыю нацыянальна-культурнага жыцця беларускай меншасці ў Латвіі. Дадзены працэс адбываўся шляхам уцягвання ў нацыянальную працу сталічнага і латгальскага беларускага настаўніцтва. Ключавую ролю ў гэтым адыграў Кастусь Езавітаў, які з'яўляўся галоўным рухавіком і піянерам беларускага жыцця ў Латвіі. Дзякуючы яму ў стварэнне беларускіх арганізацый і ўстаноў заангажаваліся іншыя дзеячы ў той ці іншай ступені звязаныя з БНР: Іван Краскоўскі, Мікалай Дзямідаў, Уладзімір Пігулеўскі, Эдвард Будзька, Паўліна Мядзёлка-Грыб, Сцяпан Сіцько. Да "бэнээраўцаў" далучыліся такія мясцовыя настаўнікі, як: Сяргей і Вольга Сахаравы, Якуб Кастылюк, Аляксандр Родзька, Ян Шчорс, Рыгор Плыгаўка, Мікалай Талерка і іншыя. З цягам часу да "старога" пакалення адраджэнцаў далучыліся нацыянальныя дзеячы новага пакалення. У першую чаргу гэта былі выхаванкі беларускіх школ і гімназій. Некаторыя з іх далучыліся да беларускай дзейнасці, у тым ліку – педагагічнай, якія плённа працавалі на карысць роднага народу і яго асветы. З муроў Лудзенскай і Даўгаўпілскай беларускіх гімназій выйшлі такія таленты, як: паэты і пісьменнікі Валянціна Казлоўская (псеўданім: Лясная Кветка), Пётр Масальскі (псеўданім: Пятро Сокал), Якуб Воркуль, Віктар Вальтар; драматург Язэп Камаржынскі; кампазітарка Юлія Фельдман-Александровіч; спявачкі Надзея Макалаева-Камісар і Ганна Бедарава; мастакі Пятро Мірановіч, Міхась Калінін, Лявон Тамашыцкі, Баляслаў Даўкшта; грамадскія дзеячы і педагогі Пятро Журкоўскі, Алесь Махноўскі, Казімір Мяжэцкі, Вераніка Слосман, Францішак і Язэп Клагішы[1].

Беларускі рух у Латвіі не быў штучнай з'явай, да якой далучаліся кіруючыся кан'юнтунымі памкненнямі. Ён даволі трывала запусціў карані сярод часткі мясцовага насельніцтва. Асабліва гэта тычыцца вучнёўскай моладзі, якая дзякуючы беларускім школам нацыянальна загартавалася на ўсё жыццё. Нярэдка маладыя людзі далучаліся на беларускай дзейнасці насуперак волі свайго сацыяльнага асяроддзя. У якасці прыкладу можна прывесці ўрывак з аўтабіяграфіі Алеся Сальцэвіча: "*Бацькі мае, хоць і яўныя беларусы, але гэта ня могуць зразумець. Мне шмат дасталося ад іх, а так*

[1] К. Езавітаў, *Беларускія мастакі ў Латвіі* [у:] *Крывіцкія руны. Вып. II: Беларускі культурны мацярык у Латвіі*, рэд. М. Казлоўскі, С. Панізнік, Менск 2017, с. 51–52.

сама й радні, за тое, што я крывіч, не хаваю свае крыўскае /беларускае/ паходжанне"[2].

Беларускі рух у Латвіі меў т.зв. наступальны характар. Яго дзеячы праводзілі "нацыянальную экспансію" на нацыянальна-несвядомую латгальскую вёску. Пры гэтым беларусы намагаліся выкарыстоўваць ліберальнае заканадаўства Латвійскай Рэспублікі ў мэтах забеспячэння нацыянальна-культурных інтарэсаў і патрэб суайчыннікаў. Першыя крокі беларускага руху былі засяроджаны на асветнай справе, паколькі – як адзначаў Кастусь Езавітаў – латвійскія беларусы павінны былі "*спачатку адваяваць сабе права на сваю мову і школу, права звацца нацыяй у Латвіі*"[3]. Невыпадкова, што галоўным клопатам мясцовай беларускай інтэлігенцыі было развіццё сістэмы пачатковай і сярэдняй адукацыі. Беларускія дзеячы небеспадстаўна лічылі школы кузняй беларускай нацыянальнай свядомасці і гарантам захавання беларускай прысутнасці ў краіне. Варта падкрэсліць, што беларусы распачалі сваю школьную працу пазней чым астатнія нацмены. Нямецкія, рускія і габрэйскія школы існавалі з 1919 г., польскія пачалі развівацца годам пазней. Тым часам беларускія школы пачалі адчыняцца толькі ў 1921/1922 г. Нягледзячы на гэта беларускую працу ў школьнай галіне належыць лічыць вельмі плённай. Сведчыць аб гэтым факт, што ў першыя гады існавання беларускага школьніцтва ў падпарадкаванні Беларускага школьнага аддзела Міністэрства асветы Латвіі знаходзілася больш за пяцьдзясят беларускіх школ у Латгаліі і Рызе. Праз беларускія школьныя ўстановы ў міжваенны час прайшло некалькі дзясятак тысяч дзяцей (пераважна сялянскага паходжання), а некалькі соцень атрымала сярэднюю асвету. Выхаванцы беларускіх школ і гімназій ўваходзілі ў дарослае жыццё, а многія з іх назаўсёды станавіліся свядомымі беларусамі. Некаторыя беларускія юнакі і дзяўчаты атрымалі вышэйшую адукацыю ў латвійскіх ВНУ. Частка выхаванцаў беларускіх гімназій скончыла польскія, чэхаславацкія і савецкія вышэйшыя школы.

Акрамя школ, у Латвіі дзейнічаў шэраг культурна-асветных таварыстваў, кожнае з якіх налічвала ад 100 да 500 сяброў. Праявамі беларускай актыўнасці належыць лічыць дзейнасць аматарскага тэатру, выданне прэсы, кнігавыдавецтва, а таксама палітычныя партыі і арганізацыі, якія ставілі за мэту правядзенне сваіх прадстаўнікоў у латвійскі парламент. Ідэйным стрыжнем беларускага нацыянальнага жыцця былі педагогі. Як слушна адзначае І. Апіня, галоўнай постаццю ў беларускім руху ў Латвіі

---

[2] А. Горны, *Алесь Сальцэвіч – невядомы дзеяч беларускай меншасці ў Латвіі ў міжваенны перыяд* [у:] *Гісторыя Беларусі ў XX стагоддзі. Памяці прафесара Івана Коўкеля*, рэд. А. Горны, Гродна 2017, с. 214.

[3] *Сацыяльнае самаўсьведамленне беларускае нацыянальнае меншасьці ў Латвіі*, "Голас беларуса" 1928, № 59 ад 10 ліпеня, с. 1.

было настаўніцтва, якое выконвала ролю мясцовай нацыянальнай інтэлігенцыі[4]. Менавіта настаўнікамі былі кіраўнікі і найбольш актыўныя сябры беларускіх грамадска-культурных і палітычных арганізацый. Галоўным асяродкам нацыянальна-культурнай працы з'яўлялася Латгалія як месца кампактнага пражывання беларускамоўнага насельніцтва. Аднак прыкметную ролю ў беларускім жыцці адыгрывала таксама Рыга, дзе жыла частка беларусаў. Менавіта сталіца была сядзібай Беларускага школьнага аддзела Міністэрства асветы, тут выдаваліся галоўныя газеты і пражывалі многія дзеячы, у тым ліку нястомны змагар за правы латвійскіх беларусаў К. Езавітаў. З цягам часу значэнне сталічнага беларускага цэнтру павялічылася пераўзыходзячы латгальскі.

Неабходна падкрэсліць, што беларуская меншасць знаходзілася ў больш складанай сітуацыі, чым іншыя нацмены. Адны (немцы, палякі, літоўцы) падтрымліваліся з-за мяжы ўласнымі дзяржавамі, іншыя (рускія, габрэі) мелі салідную ўнутраную матэрыяльную базу. Тым часам, беларуская меншасць у Латвіі была прадстаўлена ў асноўным незаможным сялянствам, якое не было ў стане матэрыяльна падтрымліваць нацыянальную дзейнасць. Латвійскія беларусы былі практычна пазбаўлены вонкавай дапамогі. Праўда, мясцовыя актывісты ўтрымлівалі пэўныя сувязі з Савецкай Беларуссю. Жаданне латвійскіх беларусаў да падтрымання нейкіх кантактаў з Менскам належыць разглядаць як натуральнае імкненне дыяспары да захвання якой-колечы лучнасці з метраполіяй ва ўмовах адсутнасці незалежнай беларускай дзяржавы. Дадатковым фактарам, што спрыяў гэтым кантактам, была спакуслівая палітыка беларусізацыі, якая праводзілася ў БССР у 1920-я гг. Варта дадаць, што большасць беларускіх дзеячаў Латвіі прытрымлівалася левых (сацыялістычных) поглядаў, што ідэйна магло іх збліжаць да ўсходняга суседа. Савецкі бок ставіўся да супрацоўніцтва з латвійскімі беларусамі як да сродку, які даваў магчымасць умяшання ва ўнутраныя справы "буржуазнай" Латвіі і вядзення ў яе межах дэструктыўнай дзейнасці. Разам з тым лідары латвійскіх беларусаў удзельнічалі ў агульнабеларускім нацыянальным жыцці. Яны захоўвалі сувязь з суайчыннікамі ў Польшчы, Чэхаславакіі, Германіі і ЗША, адкуль атрымоўвалі пэўную дапамогу.

Мясцовы беларускі рух існаваў у апазіцыі да рускага і польскага. Беларуска-рускія і беларуска-польскія адносіны ў Латвіі былі вельмі напружанымі, а нават варожымі. Нягледзячы на пэўныя польска-рускія рознагалоссі ў пытанні стаўлення да мясцовага беларускага руху мясцовыя польскія

---

[4] І. Апіня, *На берагах Даўгавы – Дзвіны: Латышска-беларускія ўзаемасувязі* [у:] *Беларусіка=Albarutheniса 6. Беларусь паміж Усходам і Захадам: Праблемы міжнацыянальнага, міжрэлігійнага і міжкультурнага ўзаемадзеяння, дыялогу і сінтэзу*, рэд. У. Конан і інш, Менск 1997, с. 234.

і рускія дзеячы захоўвалі аднадумства. Як рускія, так і польскія дзеячы разглядалі беларускі рух як перашкоду на шляху ўласнай нацыянальнай экспансіі ў дачыненні да славянамоўнага насельніцтва Латвіі, за "душы і сэрцы" якіх змагаліся беларускія, рускія і польскія дзеячы. Канфлікт быў непазбежны, паколькі ўсе разумелі, што беларускі рух можа развівацца толькі коштам рускага і польскага, а таксама наадварот. Праўда, кажучы пра варожыя адносіны паміж латвійскімі палякамі і беларусамі належыць адзначыць, што тычыліся яны прадстаўнікоў нацыянальных эліт. Тым часам адносіны паміж звычайнымі людзьмі не былі абцяжараны антаганізмам. Спрыяла гэтаму канчаткова несфарміраваная нацыянальная ідэнтычнасць значнай часткі славянамоўнага латгальскага сялянства. Здаралася, калі адны і тыя ж асобы пад уплывам грамадска-палітычных фактараў і бягучай кан'юнктуры дэкларавалі розную нацыянальнасць, а таксама ў розны час бралі ўдзел у працы як беларускіх, так і рускіх ці польскіх арганізацыі і асветных устаноў.

Стаўленне латвійскіх улад да беларусаў мянялася ў залежнасці ад шэрагу фактараў. Найбольш спрыяльнай была палітыка ў першыя гады незалежнасці Латвіі, калі ўлады ў Рызе разглядалі беларускую актыўнасць як сродак затрымання ці запавольвання празмерных польскіх уплываў у Латгаліі. Апошнія лічыліся небяспечнымі для тэрытарыяльнай цэласнасці краіны, паколькі існавала польска-латвійская тэрытарыяльная спрэчка ў Ілукштанскім павеце, а латышы асцерагаліся сепаратысцкіх настрояў сярод латгальскіх палякаў. У наступныя гады латвійскія ўлады пачалі заўважаць рост прасавецкіх і нацыяналістычных настрояў сярод беларускай грамадскасці, што знайшло сваё адлюстраванне ў больш стрыманым стаўленне да гэтай нацменшасці. Аднак у перыяд парламенцкай дэмакратыі (да 1934 г.) Латвійская Рэспубліка ажыццяўляла вельмі ліберальную палітыку ў дачыненні да ўсіх нацыянальных меншасцей гарантуючы ім шырокую нацыянальна-культурную аўтаномію. Латвійскія беларусы карысталіся ўсімі дабрадзействамі дэмакратычнай дзяржавы. Адзначам, што больш спрыяльных, чым у Латвіі, ўмоў нацыянальна-культурнага жыцця беларусы нідзе не мелі, а становішча іх суродзічаў у іншых краінах было непараўнальна горшым.

Сітуацыя беларускай меншасці пагоршылася пасля дзяржаўнага перавароту, які 15 траўня 1934 г. здзейсніў Карліс Ульманіс. Усталяванне ў краіне аўтарытарнага кіравання значна абмежавала беларускую актыўнасць, але не спыніла яе цалкам. І хоць нельга сказаць, што пасля ўсталявання ў Латвіі рэжыму Ульманіса беларуская меншасць была цалкам пазбаўлена магчымасці арганізацыйнай працы, яе лідары не праяўлялі значнай актыўнасці. Адчувальным ударам стала фактычная ліквідацыя школьнай аўтаноміі, у выніку якой былі зачынены ўсе беларускія пачатковыя школы ў Латгаліі. Стан крызісу паглыбляў факт, што латвійскія беларусы ў гэты

час былі пазбаўлены якой-колечы вонкавай падтрымкі, паколькі беларускі рух у іншых краінах таксама перажываў крызіс, а ў Савецкай Беларусі палітыка беларусізацыі была згорнута і змянілася сталінскімі рэпрэсіямі. Напярэдадні пачатку ІІ сусветнай вайны адзінай арганізацыяй беларускай меншасці з'яўлялася Таварыства беларускіх настаўнікаў у Латвіі (кіраўнік М. Дзямідаў). Пазней яго ролю пераняло Таварыства беларусаў у Латвіі (старшыня П. Мірановіч), вакол якога гуртаваўся найбольш дзейны беларускі нацыянальны актыў Латвіі.

Вялікім выпрабаваннем для латвійскіх беларусаў была ІІ сусветная вайна, якая адціснула на нацыянальным краявідзе значны адбітак. Пачатак вайны аднак не паклаў канца беларускай актыўнасці ў Латвіі. Як ва ўмовах савецкай, так і нямецкай акупацыі беларускае нацыянальнае жыццё па-ранейшаму існавала. Аднак дадзеная тэма будзе прадметам асобнага даследавання.

Пачатак ІІ сусветнай вайны і як наступства савецкая і нямецкая акупацыя Латвіі перагарнулі істотны раздзел у гісторыі беларускай меншасці ў гэтай краіне. Гісторыі, якая была напісана потам і крывёй, самаахвярным высілкам і цяжкай працай адносна невялікай групы беларускіх дзеячаў, якія лічылі сваёй радзімай адначасова Беларусь і Латвію. Цяжка адназначна ацаніць вынікі і эфектыўнасць іх працы. Праведзенае даследаванне дазваляе зрабіць выснову, што значная частка беларускамоўнага насельніцтва Латвіі, якое было адрасатам нацыянальнай агітацыі беларускіх дзеячаў, захоўвала абыякавасць да актыўнай нацыянальна-культурнай і грамадскай дзейнасці. З іншага боку варта памятаць, што з падобнымі цяжкасцямі змагаліся іншыя нацмены (напрыклад, палякі), хоць яны знаходзіліся ў лепшым матэрыяльным становішчы чым беларусы. Можна спрачацца пра маштаб і памеры ўплыву беларускага руху на жыхароў Латвіі, але бясспрэчным з'яўляецца факт, што беларуская ідэнтычнасць у гэтай краіне ў разгледжаны час існавала і развівалася нягледзячы на шматлікія складанасці і перашкоды.

Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры

Архівалii

Архіў новых актаў (Archiwum Akt Nowych w Warszawie, AAN), Варшава
Фонд 15 – Міністэрства сацыяльнай апекі (Ministerstwo Opieki Społecznej)
Фонд 322 – Міністэрства замежных спраў (Ministerstwo Spraw Zagranicznych)

Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛіМ), Менск
Фонд 3 – Калекцыя дакументаў аддзела рукапісаў Беларускага музея імя Івана Луцкевіча ў г. Вільня

Бібліятэка і Архіў Інстытута Гувера – Стэнфардскі ўніверсітэт (The Hoover Institution Library and Archives – Stanford University, HI), Стэнфард
Фонд – Калекцыя Кастуся Езавітава (Collection K. Yezovitov)

Бібліятэка імя Урублеўскіх Літоўскай акадэміі навук (Lietovos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka, LMAVB), Вільня
Фонд 21 – Віленскія беларускія зборы (Vilniaus baltarusių fondas)

Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі (Государственный архив Росссийской Федерации, ГАРФ), Масква
Фонд 5875 – Іван Ермачэнка

Латвійскі дзяржаўны гістарычны архіў Латвійскага нацыянальнага архіва (Latvijas Nacionālais arhīvs Latvijas Valsts vēstures arhīvs, LVVA), Рыга
Фонд 1313 – Міністэрства замежных спраў (Latvijas Ārlietu Ministrija)
Фонд 1612 – Акруговы суд Латвійскай Рэспублікі. Воп. 14. Латгальскі акруговы суд (Latvijas Republikas apgabaltiesas. Ap. 14. Latgales apgabaltiesas)
Фонд 1632 – Міністэрства асветы (Izglītības ministrija. AP. 2), 1918–1944
Фонд 1690 – Латвійская сельскагаспадарчая палата (Latvijas Lauksaimniecības kamera)

Фонд 1747/5 – Беларускае тэатральнае таварыства ў Латвіі (Baltkrievu teātra biedrība Latvijā)
Фонд 1826 – Латвійскія таварыствы асветы і культуры. Беларускае культурна асветнае таварыства "Рунь" (Latvijas izglītības un kultūras veicināšanas biedrības. Baltkrievu kultūras izglītības biedrība "Ruņ"), 1924–1936
Фонд 1848 – Беларускі прасветны кааператыў "Культура і праца" (Baltkrievu izglītības kooperatīvs "Kultūra un darbs"), 1927–1936
Фонд 1897 – Беларускае навукова-краязнаўчае таварыства ў Латвіі (Latvijas "Baltkrievu dzimtenes zinātniskās pētīšanas biedrība"), 1926–1936
Фонд 2067 – Павятовыя і гарадскія школы Даўгаўпілса. Вопіс 10. Даўгаўпілская беларуская пачатковая школа (Daugavpils pilsētas un apriņķa skolas. Apr. 10. Daugavpils pilsētas baltkrievu pamatskola), 1934–1944
Фонд 2067 – Павятовыя і гарадскія школы Даўгаўпілса. Вопіс 19. Даўгаўпілская дзяржаўная беларуская гімназія (Daugavpils pilsētas un apriņķa skolas. Apr. 19. Daugavpils Valsts baltkrievu ģimnāzija), 1921–1936
Фонд 2125 – Міністэрства асветы. Дэпартамент асветы нацыянальных меншасцей. Беларускі школьны аддзел (Izglītības Ministrija. Mazākumtautību izglītības pārvaldes. Baltkrievu izglītības pārvalde), 1919–1940
Фонд 2574 – Палітычны дэпартамент Міністэрства замежных спраў (Ārlietu Ministrijas Politiskais Departaments)
Фонд 2575 – Дыпламатычныя і консульскія прадстаўніцтвы Латвіі за мяжой. Амбасада Латвіі ў Польшчы (Latvijas diplomātiskās un konsulārās pārstāvniecības ārzemēs. Latvijas Sūtniecība polija)
Фонд 2750 – Рыжскае асветнае таварыства "Беларуская хата" (Rīgas baltkrievu izglītības biedrība "Belorusskaja hata")
Фонд 2924 – Таварыства беларусаў Латвіі (Latvijas baltkrievu biedrība)
Фонд 3009 – Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў у Дзяржаўны Сойм, гарадскія, павятовыя і валасныя самаўрады ў Латвіі (Latvijas Saeimas, pilsētu, apriņķu un pagastu pašvaldību baltkrievu vēlētāju biedrība)
Фонд 3175 – Прыватная школа Таварыства беларускіх настаўнікаў Латвіі (Latvijas baltkrievu skolotāju biedrības privātā ģimnāzija)
Фонд 3219 – Консульства Польшчы ў Рызе (Polijas konsulāts), 1920–1962
Фонд 3235 –Палітычнае ўпраўленне паліцыі (Politiskās policijas pārvalde), 1918–1940
Фонд 4932 – Лудзенскія павятовыя і парафіяльныя школы. Лудзенская дзяржаўная беларуская гімназія (Ludzas apriņķa pilsētu un pagastu skolas. Ludzas Valsts baltkrievu ģimnāzija), 1919–1926
Фонд 5019 – Латвійская партыя незалежных сацыялістаў (Latvijas Neatkarīgo sociālistu partija)
Фонд 5213 – Дэпартамент сацыяльнай апекі Міністэрства сацыяльнай апекі (Tautas labklājības ministrija. Sabiedriskās aizgādības departaments)
Фонд 6845 – Педагагічныя курсы Латвіі. Беларускія настаўніцкія курсы 1924–1928. Дзяржаўныя беларускія педагагічныя курсы 1923–1936 (Pedagoģiskie kursi Latvijā. Baltkrievu skolotāju kursi 1924–1928. Valsts baltkrievu pedagoģiskie kursi 1923–1936)
Фонд 7077 – Брадайжская беларуская пачатковая школа Пылдзенскай воласці Лудзенскага павета (Brodaižu baltkrievu pamatskola (Pildas pagasts, Ludzas apriņķis), 1922–1938
Фонд 7131 – Іаан Померс, архіепіскап Латвійскай праваслаўнай царквы (Jānnis Pommers, Latvijas pareizticīgo baznīcas arhibīskabs)
Фонд 7427 – Студэнты Латвійскага ўніверсітэта (Latvijas Universitātes student)

Літоўскі цэнтральны дзяржаўны архіў (Lietuvos centrinis valstybės archyvas, LCVA), Вільня
Фонд 51 – Ваяводская ўправа ў Вільні (Urząd Wojewódzki w Wilnie)
Фонд 156 – Дзяржаўная ўправа пасрэдніцтва працы ў Вільні (Państwowy Urząd Pośrednictwa Pracy w Wilnie)
Фонд 175 – Універсітэт Стэфана Баторыя ў Вільні (Stepono Batoro universitetas Vilniuje)
Фонд 366 – Арганізацыя беларускіх студэнцкіх таварыстваў у Празе (Baltarusių studentų organizacijų susivienijimas Prahoje)
Фонд 582 – Рада міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі (Baltarusijos Liaudies Respublikos Ministrų Taryba)

Нацыянальны архіў (Národní Archiv, NA), Прага
Фонд 908 – Міністэрства замежных спраў – Руская дапаможная акцыя (Ministerstva zahraničních věcí – Ruská pomocná akce)

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ), Менск
Фонд 4п – ЦК Кампартыі Беларусі
Фонд 325 – Народны сакратарыят Беларускай Народнай Рэспублікі
Фонд 458 – Канстанцін Езавітаў
Фонд 567 – Тамаш Грыб
Фонд 864 – Консульства БНР у Рызе

Расійскі дзяржаўны вайсковы архіў (Российский государственный военный архив, РГВА), Масква
Фонд 2765

Славянская бібліятэка (Slovanská knihovna, SK), Прага
Калекцыя беларускіх дакументаў

Эстонскі нацыянальны архіў (Eesti Rahvusarhiiv, ERA), Талін
Fondi 957 – Міністэрства замежных спраўаў (Välisministeerium)
Fondi 1619 – Замежная дэлегацыя Эстоніі (Eesti Välisdelegatsioon)

Прэса

“Biuletyn Urzędu Emigracyjnego w Sprawach Migracji i Osadnictwa” (Варшава), 1928–1930
“Dzwon” (Даўгаўпілс), 1930–1931
“Krynica” (Вільня), 1924, 1939
“Kurier Wileński” (Вільня), 1933–1934
“Nasze Życie” (Рыга), 1936–1939
“Słowo” (Вільня), 1939
“Tygodnik Polski” (Рыга), 1927–1928
“Tygodnik Rolniczy” (Вільня), 1938
“Беларускае слова” (Даўгаўпілс), 1931
“Беларуская крыніца” (Вільня), 1934
“Беларуская школа ў Латвіі” (Рыга), 1926–1933

“Белорусская трибуна” (Чыкага), 1926–1932
“Гаспадар” (Рыга), 1926
“Голас беларуса” (Рыга), 1925–1929
“Голас Радзімы” (Менск), 1980
“Двинский голос” (Даўгаўпілс), 1925–1932
“Думка беларуса” (Даўгаўпілс), 1930
“Змаганьне” (Вільня) 1923
“Крывіч” (Коўна), 1923–1927
“Латгальская мысль” (Даўгаўпілс)
“Летапіс ТБШ” (Вільня), 1933
“Народнае слова” (Менск), 1995
“Наша доля” (Даўгаўпілс), 1930
“Пагоня” (Рыга), 1930–1931
“Раніца” (Берлін), 1939–1945
“Рижский курьер” (Рыга), 1922–1924
“Родны край” (Вільня), 1933, 1936
“Родная школа” (Рэжыкнэ), 1930
“Сегодня” (Рыга), 1919–1940
“Трудовая мысль” (Рыга), 1930–1934
“Школа і жыццё” (Рыга), 1930
“Шлях праўды” (Рыга), 1930

Апрацаванні

20. gadsimta Latvijas vēsture. Latvija no gadsimta sākuma līdz neatkarības pasludināšanai 1900–1918, red. V. Bērziņš, Rīga 2000.

Albin Janusz, *Polski ruch narodowy na Łotwie w latach 1919–1940*, Wrocław 1994.

Apine Ilga, *Baltkrievi Latvijā*, Rīga 1995.

Błaszczak Tomasz, Matiash Iryna, Michaluk Dorota, *Iwan Kraskowski (1880–1955). W służbie Białorusi i Ukrainie*, Białystok 2019.

Błaszczyk Tomasz, *Białorusini w Republice Litewskiej 1918–1940*, Białystok 2017.

Centrā tautas skaitīšana Latvija 1935. gadā, *IV tautība,* sastādījs: V. Salnītis, red. M. Skujenieks, Rīga 1937.

Ceturta tautas skaitīšana Latvijā 1935 gada, sastādijīs V. Salnītis un redigējis M. Skujenieks, Rīga 1936.

Chałasiński Józef, *Młode pokolenie chłopów. Procesy i zagadnienia kształtowania się warstwy chłopskiej w Polsce*, t. 2: *Świat życia, pracy i dążeń kół młodzieży wiejskiej*, Warszawa 1938.

Drugoveiko Milana, *Baltkrievu inteliģences politiskā doma Latvijā (1920–1934) Konstantīna Jezovitova piemērs*, “Latvijas Universitātes Žurnāls. Vēsture” 2023, № 13, 56–67.

Drugoveiko Milana, *Konstantīna Jezovitova (1896–1946) darbības analīze Latvijā (1919–1934)*, “Jauno vēsturnieku zinātniskie lasījumi” 2021, № 7, 220–229. lpp.

Eberhardt Piotr, *Liczebność i rozmieszczenie ludności polskiej na Łotwie*, “Czasopismo Geograficzne” 1997, t. 3–4.

Eberhardt Piotr, *Polska ludność kresowa: rodowód, liczebność, rozmieszczenie*, Warszawa 1998.

Eberhardt Piotr, *Problematyka narodowościowa Łotwy*, Warszawa 1998.

Engelhardt von Eugen Freinherr, *Weissruthenien. Volk und Land*, Berlin 1943.

Gabranova Jūlija, *Baltkrievu un latviešu valodas kontakti 20. gadsimta pirmajā pusē un mūsdienās*, Promocijas darbs, Liepāja 2016.

Gabranova Jūlija, *Education system in Belarusian in Latvia: history and overview* [in:] *In the Schadow of Others. Belarusia-Latvian Relations from the Past to Nowadays,* ed. Mirosław Jankowiak, Kiryl Kascian, Prague 2022, p. 293–312.

Garbiński Jerzy, Turonek Jerzy, *Białoruski ruch chrześcijański XX wieku. Słownik biograficzno-bibliograficzny*, Warszawa 2003.

Gierowska-Kałłaur Joanna, *Stosunek państwa łotewskiego do miejscowych Polaków i Białorusinów w początkach niepodległości łotewskiej*, "Studia z Dziejów Rosji i Europy Środkowo--Wschodniej" 2011, t. 46, s. 181–216.

Głogowska Helena, *Eugeniusz Bartul – poeta pogranicza białorusko-łotewskiego* [in:] *In the Schadow of Others. Belarusia-Latvian Relations from the Past to Nowadays*, ed. Mirosław Jankowiak, Kiryl Kascian, Prague 2022, p. 417–443.

Grzybowski Jerzy, *Białorusini na Łotwie (1920–1939) oczami dyplomatów polskich w Rydze*, "Przegląd Środkowo-Wschodni" 2016, t. 1, s. 281–307.

Grzybowski Jerzy, *Stosunki polsko-białoruskie na Łotwie w latach 1920–1940* [w:] *Dialog kultur czy zarzewie konfliktów? Problematyka mniejszości narodowych i etnicznych w Europie*, red. T. Gajownik, P. Pietnoczko, K. Sidorkiewicz, Olsztyn 2017, s. 33–48.

Grzybowski Jerzy, *Emigracja zarobkowa z Polski na Łotwę i do Estonii w latach 1928–1939*, Warszawa 2021.

Grzybowski Jerzy, *Problematyka polskich robotników sezonowych na Łotwie na łamach tygodnika "Nasze Życie"*, "Studia Interkulturowe Europy Środkowo-Wschodniej" 2020, t. 15, s. 245–276.

Grzybowski Jerzy, *Савецкая рэчаіснасць на бачынах беларускай газеты ў Латвіі "Голас Беларуса" (1925–1929 г.)* [y:] *"Światła masz tyle w sobie…". Ze studiów wschodniosłowiańskich. Księga pamiątkowa dedykowana Profesorowi Aleksandrowi Barszczewskiemu w osiemdziesiątą piątą rocznicę urodzin*, red. M. Kaczmarczyk, A. Nowacki, M. Sidor, B. Siwek, Lublin 2015, s. 207–222.

Jankowiak Mirosław, *Białorusini Łatgalii – autochtoni czy imigranci?*, "Acta Albaruthenica" 2008, № 8, s. 264–274.

Jankowiak Mirosław, *Prasa białoruska międzywojennej Łotwy (przegląd wydawnictw)*, "Studia Białorutenistyce" 2021, t. 15, s. 11–31.

Jankowiak Mirosław, *Gwary białoruskie na Łotwie w rejonie krasławskim: studium socjolingwistyczne*, Warszawa 2009.

Jankowiak Mirosław, *Współczesne gwary białoruskie na Łotwie. Charakterystyka. Wybór tekstów*, Praha 2018.

Janowska Halina, *Emigracja zarobkowa z Polski 1918–1939*, Warszawa 1981.

Jēkabsons Ēriks, *Białorusini na Łotwie w okresie okupacji hitlerowskiej (1941–1945)*, "Studia Interkulturowe Europy Środkowo-Wschodniej" 2014, t. 7, s. 13–26.

Jēkabsons Ēriks, Grzybowski Jerzy, *Łotewski "ślad" atamanów białoruskich Wiaczesława Rozumowicza-Chmary i Wiaczesława Adamowicza-Dziergacza*, "Białoruskie Zeszyty Historyczne" 2014, z. 42, s. 80–96.

Jēkabsons Ēriks, *Mniejszość polska w Republice Łotewskiej 1918–1939* [w:] *Polacy na Łotwie*, red. E. Walewander, Lublin 1993, s. 151–172.

Jēkabsons Ēriks, *Skład narodowościowy mieszkańców 6 gmin powiatu iłłuksztańskiego w XIX–XX w. jako główny powód sporu terytorialnego między Łotwą a Polską w okresie*

międzywojennym [w:] *Granice i pogranicza. Historia codzienności i doświadczeń*, t. I, red. Marzena Liedke, Joanna Sadowska, Jan Trynkowski, Białystok 1999, s. 225–233.

Jēkabsons Ēriks, *Stosunki między Łotwa i Białoruską Republiką Ludową w latach 1919–1921*, "Białoruskie Zeszyty Historyczne" 1997, z. 7, s. 49–62.

Jēkabsons Ēriks, *Zaangażowanie państwowo-polityczne szlachty polskiej Łatgalii (byłych Inflant Polskich) w pierwszej ćwierci XX wieku*, "Przegląd Wschodni" 1997, t. 4, z. 3 (15), s. 513–522.

Karnups Viesturs Pauls, *Kārļa Ulmaņa autoritārā valdīšanas laiks (1934–1940)* [w:] *Latvijas tautsaimniecības vēsture*, sastādītājs Gatis Krūmiņs, Rīga 2017, s. 134–162.

Kazachonak Katsiaryna, *Cooperation of Latvian Belarusians with the non-belarusian political organizations of Latvia in 1928–1931*, "Nordic and Baltic Studies Review" 2016, № 1, p. 160–171.

Keller K., *Stosunki narodowościowe, społeczne ekonomiczne i na Inflantach Polskich i polityczne w Łatgalii*, Rypin 1920.

Kemps Francis, *Latgales likteņi: ainas no senas un jaunākās pagātnes*, Rēzekne 1938.

Kopeć Bohdan, *Wychodźstwo sezonowe z Ziemi Wileńskiej do Łotwy*, Wilno 1938.

Krasnais Vilberts, *Baltkrievi kā latviešu tautas zars*, Rīgā 1938.

Kunicka Kristine, *A Pole Who Contributed to Belarusian Education and Cultural Life in Latvia: The Peculiar Case of Konstanty Aleksandrowicz* [in:] *In the Schadow of Others. Belarusia-Latvian Relations from the Past to Nowadays*, ed. Mirosław Jankowiak, Kiryl Kascian, Praha 2022, p. 377–386.

Landau Ludwik, *Wychodźstwo sezonowe na Łotwę i do Niemiec w 1937 roku: na podstawie ankiety Instytutu Gospodarstwa Społecznego*, Warszawa 1966.

Łatyszonek Oleg, *Białoruskie formacje wojskowe. 1917–1923*, Białystok 1995.

Łatyszonek Oleg, *Mikołaj Demidow (1888–1967)*, "Białoruskie Zeszyty Historyczne" 1995, z. 1, s. 174–180.

Latvijas lauksaimniecība 1938, Valsts statistikā pārvalde, Rīga 1939.

Latvijas Republikas Saeimas vēlēšanas 1922 gadā, tekst un redakcija M. Skujenieka, Rīgā 1923.

Latvijas Republikas Saeimas vēlēšanas 1928 gadā, tekst un redakcija M. Skujenieka, Rīgā 1929.

Latvijas Republikas Saeimas vēlēšanas 1931 gadā, tekst un redakcija M. Skujenieka, Rīgā 1933.

Latvijas statistikas gada grāmata 1921, Rīga 1922.

Łossowski Piotr**,** *Kraje bałtyckie na drodze od demokracji parlamentarnej do dyktatury: 1918–1934*, Wrocław 1972.

Łossowski Piotr, *Łotwa nasz sąsiad: stosunki polsko-łotewskie w latach 1918–1939*, Warszawa 1990.

Mačiulis Dangiras, Jēkabsons Ēriks, *Lietuviai Latvijos Respublikoje 1918–1940 metais*, Vilnius 2018.

Mačiulis Dangiras, *Lietuvos pasiuntinybės pastangos konsoliduoti lietuvių bendruomenę tarpukario Latvijoje*, "Lietuvos istorijos metraštis" 2007, № 2, Vilnius: LII leidykla, 2008, p. 42.

Maliszewski Edward, *Polacy na Łotwie*, Warszawa 1922.

Manteuffel Gustaw, *Inflanty Polskie oraz Listy znad Bałtyku*, wstęp, red. i oprac. K. Zajas, Kraków 2009.

Michaluk Dorota, *Białoruska Republika Ludowa 1918–1920. U podstaw białoruskiej państwowości*, Toruń 2010.

Mironowicz Antoni, *Wpływ wyznań religijnych na kształtowanie się białoruskiej świadomości narodowej w XIX wieku* [w:] *Tożsamość białoruska: doświadczenia przeszłości i wyzwania*

teraźniejszości. W 30. rocznicę uzyskania przez Białoruś niepodległości, red. J. Getka, J. Grzybowski, Warszawa 2021, s. 27–42.
Ormicki Wiktor, *Struktura demograficzna wychodźstwa sezonowego z Ziemi Wileńskiej do Łotwy w roku 1935*, Wilno 1938.
Otra tautas skaitišana Latvijā. 1925. gada 10. Februari, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1925.
Otra tautas skaitišana Latvijā. V. Nodarbošanās, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1928.
Palaša Ieva, *Darbaspēka imports Latvijas laukos starpkraru perioda*, Maģistra darbs, Rīga 2005.
Pilsētu apraksti (pēc 1935. g. tautas, sejumu-majlopu un tirdzniecības-rūpniecības skaitīšanas materiāliem). Trešā daļa, Rīga 1936.
Różycki Jerzy, *Polacy na Łotwie*, Warszawa 1930.
Siemakowicz Marian, *Organizacja szkolnictwa dla ludności białoruskiej w II Rzeczypospolitej*, "Białoruskie Zeszyty Historyczne" 1999, № 12, s. 80–132.
Skowron Władysław, *Emigracja sezonowa do Łotwy z Ziem Wschodnich*, "Rocznik Ziem Wschodnich" (Warszawa) 1938, s. 122–131.
Skrzypek Andrzej, *Stosunki polsko-łotewskie 1918–1939*, Gdańsk 1997.
Skujenieks Margers, *Latvijas statistikas atlass*, Rīga 1938.
Skujenieks Marģers, *Latvija. Zeme un iedzīvotāji*, Rīga 1927.
Śleszyński Wojciech, *Województwo poleskie*, Kraków 2014.
Srebrakowski Aleksander, *Struktura narodowościowa Kresów Północno-Wschodnich II Rzeczypospolitej w latach 1931–1939* [w:] *Przemiany narodowościowe na Kresach Wschodnich II Rzeczypospolitej 1931–1948*, red. Stanisław Ciesielski, Toruń 2004, s. 127–148.
Srokowski Konstanty, *Sprawa narodowościowa na Kresach Wschodnich*, Kraków 1924.
Stankiewicz Zbigniew, *Życie społeczno-religijne Polaków na Łotwie w okresie międzywojennym (1920–1940)* [w:] *Polacy na Łotwie*, red. Edward Walewander, Lublin 1993, s. 173–201.
Stranga Aivars, *Kārļa Ulmaņa autoritārā režīma saimnieciskā politika 1934–1940*, Rīga 2017.
Strods Heinrihs, *Latvijas lauksaimniecības vēsture no vissenākajiem laikiem līdz XX gs. 90. gadiem*, Rīga 1992.
Świechowski Marian, *W. Ks. Litewskie: ziemia i ludność w cyfrach: (tablice)*, Zakopane 1917.
Sworakowski W., *Polacy na Łotwie: uwagi o ich liczbie i rozmieszczeniu, składzie wyznaniowym, podziale według płci i wieku, analfabetyzmie i strukturze społeczno-gospodarczej na podstawie łotewskiego spisu ludności 1930 r.*, Warszawa 1934.
Symonowicz Stanisław, *Gospodarstwa rolne w gminie rzeszańskiej powiatu wileńsko-trockiego (charakter, wielkość i ilość gospodarstw w latach 1844, 1863, 1928–1930)*, Poznań 1933.
Tichomirow Andrej, *Struktura wyznaniowa i etniczna guberni witebskiej w pierwszej połowie lat 60. XIX wieku* [w:] *Problemy świadomości narodowej ludności polskiej na Białorusi, materiały III międzynarodowej konferencji naukowej, Grodno, 22–24 listopada 2004*, red. Eugeniusz Skrobocki, Grodno 2005, s. 165–182.
Topij Andrzej, *Polityka narodowościowa Łotwy w okresie rządów autorytarnych Kārlisa Ulmanisa (1934–1940)*, "Studia Historica Gedanensia" 2017, t. VIII, s. 261–280.
Treša tautas skaitišana Latvijā 1930. gadā, M. Skujenieka teksts un redakcija, Rīga 1930.
Wańkowicz Melchior, *Było to dawno*, Warszawa 1980.
Węzeł polsko-białoruski 1918–1921. Dokumenty i materiały, wybór i oprac.: W. Materski, Warszawa 2018.
Zajas Krzysztof, *Nieobecna kultura. Przypadek Inflant Polskich*, Kraków 2008.
Żarnowski Janusz, *Społeczeństwo Drugiej Rzeczypospolitej 1918–1939*, Warszawa 1973.

Алантс Олег, Гапоненко Александр, *Латгалия: в поисках иного бытия*, Рига 2012.

Андрэева Е.Г., *Беларускі педагог у Латвіі*, "Народная асвета" 2000, № 9, с. 153–159.

Андрэева Е.Г., *Сяргей Пятровіч Сахараў – вядомы педагог, этнограф і фальклярыст* [у:] *Беларускае Асветніцтва: вопыт тысячагоддзя: Матэрыялы II Міжнар. Канг.*, рэд. А. Лугоўскі і інш., Менск 2001, с. 3–9.

Апіня Ілга, *На берагах Даўгавы – Дзвіны: Латышска-беларускія ўзаемасувязі* [у:] *Беларусіка=Albaruthenica 6. Беларусь паміж Усходам і Захадам: Праблемы міжнацыянальнага, міжрэлігійнага і міжкультурнага ўзаемадзеяння, дыялогу і сінтэзу*, рэд. У. Конан і інш., Менск 1997, с. 231–234.

Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі, т. 1, кн. 1, рэд. С. Шупа, Вільня – Нью-Ёрк – Менск – Прага 1998.

Багровіч Андрэй, *Латгальцы – спрадвечныя суседзі*, "Запісы БІМіМ" 1976, т. 14, с. 67–75.

Базанов Пётр, *Братство русской правды – самая загадочная организацыя русского зарубежья*, Москва 2013.

Бароўская Вольга, *Алесь Ульянаў: старонкі жыцця (1901–1937)*, Менск 2025.

Беларускае таварыства "Прамень", Рыга 2008.

Беларускі календар. 1937 г., скл. С. Сахараў, Дзвінск 1936.

Беларускі Процэс у Латвіі, Рыга 1926.

Белорусский след в латвийской истории: биографический справочник, под общ. ред. М.Г. Королёва, Минск 2019.

Бутуліс Ілгварс, Зунда Антоній, *Гісторыя Латвіі*, Менск 2017.

Вабішчэвіч Аляксандр, *Але ж шлях да свабоды старонка праложа!* [у:] *Сыны і пасынкі Беларусі*, рэд. С. Барыс і інш., Менск 1996, с. 313–344.

Вацек Йиржи, Бабка Лукаш, *Голоса изгнанников. Периодическая печать эмиграции из советской России (1918–1945)*, Прага 2009.

Габранава Юлія, *"Голас Беларуса" – газета беларускай дыяспары ў Латвіі пачатку XX стагоддзя*, "Беларуская лінгвістыка" 2015, т. 75, с. 85–91.

Габранова Юлия, *Периодические издания на белорусском языке, изданные в период Первой Латвийской Республики (1920–1930)*, "Русская филология 25, Сборник научных работ молодых филологов" Тарту 2014, с. 348–357.

Гаврилин Александр, *Попытки реформ в Латвийской Православной Церкви во второй половине 30-х годов XX века*, "Latopisy Akademii Supraskiej" 2015, t. 5, s. 175–185.

Галынец Ал., *Вялікае апрашэньне ці вялікае удасканаленьне? (З цыклю "Штодзённыя думкі")*, Рыга 1926.

Гістарычны нарыс пяцігодзьдзя Дзьвінскай Дзяржаўнай Беларускай Гімназіі за 1922–1927 г.г., укл.: С. Сахараў, Дзвінск 1927.

Голдманис Марис, *"Белорусский" дискурс в латышской прессе (1920–1934): эволюция представления о белорусах как о самостоятельном национальном меншинстве*, "Латыши и беларусы: вместе сквозь века" 2016, № 5, с. 68–76.

Голоса изгнанников. Периодическая печать эмиграции из советской России (1918–1945), сост. Йржи Вацек и Лукаш Бабка, Прага 2009.

Голубева Наталля, *Беларусы ў Латвіі* [у:] *Беларускае замежжа*, рэд. Н. Голубева, Менск 2010, с. 188–203.

Горны Аляксандр, *Алесь Сальцэвіч – невядомы дзеяч беларускай меншасці ў Латвіі ў міжваенны перыяд* [у:] *Гісторыя Беларусі ў XX стагоддзі. Памяці прафесара Івана Коўкеля*, рэд. А. Горны, Гродна 2017, с. 210–215.

Грыбоўскі Юры, *"Латвійскі" перыяд дзейнасці Мікалая Дзямідава (1922–1942)*, "Беларускі гістарычны агляд" 2016, т. 23, с. 41–71.

Грыбоўскі Юры, *З гісторыі беларускага руху ў Латвіі ў міжваенны і ваенны пэрыяды*, "Запісы БІНіМ" 2016, т. 38, с. 457–480.

Грыбоўскі Юры, *Удзел беларусаў у парламенцкіх выбарах у Латвіі (1922–1931)*, "Беларускі гістарычны агляд" 2018, т. 25, с. 111–148.

Грыбоўскі Юры, *Узаемадачыненні паміж польскім і беларускім рухамі ў Латвіі (1920–1940)* [у:] *Зъ зычливости ку моеи отчизне. Tom pamiątkowy dedykowany profesorowi Mikołajowi Timoszukowi*, Warszawa 2017, s. 129–156.

Грыбоўскі Юры (Grzybowski Jerzy), Екабсонс Эрык (Jēkabsons Ēriks), *Кастусь Езавітаў і ягоны "бэрлінскі" дзёньнік*, "Запісы БІНіМ" 2013, т. 36, с. 216–233.

Даніловіч Браніслаў, *Ліст з Латвіі ў рэдакцыю віленскага часопісу "Шлях моладзі"*, "Запісы БІНіМ" 2014, т. 37, с. 617–620.

Дзесяць год Беларускае Школы ў Латвіі 1921–1931, Рыга 1932.

Доўгі Ян, *Беларускі нацыянал-фашызм у Латвіі*, Менск 1934.

Друговейко Милана, *"Преступный союз белорусов" в Латгалии (1924–1925 год) в документах Латвийского государственного исторического архива Национального архива Латвии*, "Przegląd Środkowo-Wschodni" 2025, № 10, s. 181-203 (у друку).

Друговейко Милана, *Размышления Константина Езовитова о своей деятельности во время заключения в Рижской Центральной тюрьме в 1930 году*, "Латыши и белорусы: вместе сквозь века" 2024, № 13, с. 75–89.

Езавітаў Кастусь, *Беларускае Культурна-Асьветнае Таварыства "Бацькаўшчына" ў Латвіі*, Рыга 1932.

Езавітаў Кастусь, *Беларуская школа. Першая пасьля леманатара кніга для чытаньня*, Рыга 1926.

Езавітаў Кастусь, *Беларусы ў Латвіі*, Рыга 1927 [перадрук: Нью-Ёрк – Менск 2013].

Езавітаў Кастусь, *Кароткі жыцьцяпіс і праходжаньне службы* [у:] *Беларуская мэмуарыстыка на эміграцыі*, укл.: Л. Юрэвіч, Нью-Ёрк 1999, с. 261–270.

Езавітаў Кастусь, *Становішча беларускае школы ў Латвіі*, Вільня 1923.

Езовитов Константин, *Белорусы и Поляки. Документы и факты из истории оккупации Белоруссии в 1918 і 1919 г.*, Ковно 1919.

Езовитов Константин, *Воспоминания*, "Неман" 1993, № 3, с. 132–162.

Екабсонс Э., *Политика Латвийского государства в отношении белорусов* [в:] *Латвия–Беларусь: 1918–2018*, редкол. М. Королёв (гл. ред.) и др., Минск 2018, с. 122–142.

Екабсонс Эрик (Jēkabsons Ēriks), *Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах* [в:] *Беларуская дыяспара як пасярэдніца ў дыялогу цывілізацый. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў*, Менск 2001, с. 47–71.

За дзяржаўную незалежнасьць Беларусі, рэд. І. Касяк, Лондан 1960.

Зелис Каспар, *Русские в Латвии в период нацистской оккупации: между прапагандой и действительностью* [в:] *Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць. Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі (Менск, 8 красавіка 2010 г.)*, Менск 2010, с. 158–164.

Знешняя палітыка Беларусі. Зборнік дакументаў і матэрыялаў. Т. 2. 1923–1927, апрац.: У. Міхнюк і інш., Менск 1999.

Знешняя палітыка Беларусі. Зборнік дакументаў і матэрыялаў. Т. 3. 1928–1941, апрац.: У. Міхнюк, Менск 2001.

История Латвии. XX век, Д. Блейере, И. Бутулис, А. Зунда и др., Рига 2005.

Казачёнок Екатерина, *"Белорусский процесс" в Латвии: обвинение, оправдание, наказание*, "Латыши и белорусы: вместе сквозь века. Сборник научных статей" 2012, с. 29–42.

Каралёў Максім, *Яніс Райніс і Эрнэст Блесэ на і аб Акадэмічнай канферэнцыі ў Менску (1926)*, "Латыши и беларусы: вместе сквозь века" 2023, № 12, с. 84–105.

Кароткі нарыс беларускага пытаньня, прадмова і каментары: А. Пашкевіч, А. Вашкевіч, А. Чарнякевіч, Менск 2009.

Коваль Вольга, *Узаемасувязі беларускай і ўкраінскай дыяспар у міжваенны перыяд*, Менск 2012.

Короткова Дарья, *Поиски союзника. Контакты советских дипломатов в Латвии с К.Б. Езовитовым в 1925–1926 гг.*, "Славянский мир в третьем тысячелетии" 2020, т. 15, № 1–2, с. 47–58.

Крывіцкія руны. Вып. II: Беларускі культурны мацярык у Латвіі, уклад., прадм., камент.: М. Казлоўскі, С. Панізьнік, Менск 2017.

Крывіцкія руны. Вып. III: Беларускі культурны мацярык у Латвіі, уклад., прадм., камент.: М. Казлоўскі, С. Панізьнік, Менск 2019.

Крывіцкія руны: Беларускія пісьменнікі Латвіі, рэд. С. Панізьнік, Менск 2003.

Крэнт Дзмітрый, *Матэрыялы Цэнтра даследаванняў старадрукаваных кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі як крыніца па гісторыі беларускага нацыянальна-культурнага жыцця ў Латвіі ў 1920–1930-ыя гг.* ,"Латыши и беларусы: вместе сквозь века" 2023, № 12, с. 114–121.

Кузнецова Т., *Белорусы в информационном пространстве Латвии 20–30-х годов XX века: М. Скуениекс "Латвия. Страна и жители" (M. Skujenieks "Latvija. Zeme un iedzīvotāji")*, "Латыши и беларусы: вместе сквозь века: Сборник научных статей" 2015*,* № . 4, с. 35–40.

Ліс Марына, *Сяргей Сахараў і беларуска-балцкія сувязі*, "Кантакты і дыялогі" 1996, № 10, с. 16–20.

Ліс Марына, *Культурна-асветніцкая і фальклярыстычная дзейнасць С.П. Сахарава ў кантэксце нацыянальна-культурнага адраджэння беларусаў Латвіі* [у:] *Фальклярыстычныя даследаванні. Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі. Зборнік артыкулаў*, рэд. Р. Кавалёва, Менск 2005, с. 19–24.

Ліс Марына, *Літаратурна-публіцыстычная дзейнасць С.П. Сахарава* [у:] *Інфармацыйнае забеспячэнне навукі: праблемы, пошукі, рашэнні. Зборнік навуковых артыкулаў*, Менск 2000, с. 130–134.

Ліс Марына, *Педагагічная і культурна-асветніцкая дзейнасць С.П. Сахарава*, "Весці Акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук" 1995, № 3, с. 99–105.

Ліс Марына, *Сяргей Сахараў. Асветнік, змаганец, фальклярыст*, "Літаратура і мастацтва" 1993, № 52, с. 13.

Лісты Янкі Станкевіча да Кастуся Езавітава (1939–1942), "Спадчына" 1999, № 5–6, с. 53–67.

Літвін Аляксей, *Генерал Булак-Балаховіч (міфы, фальсіфікацыі, рэальнасць)* [у:] *Сыны і пасынкі Беларусі*, рэд. С. Барыс і інш., Менск 1996, с. 285–310.

Ляхоўскі Уладзімір, *Ад гоманаўцаў да гайсакоў. Чыннасць беларускіх маладзёвых арганізацый у 2-й палове XIX ст – 1-й палове XX ст. (да 1939 г.)*, Смаленск 2015.

Маленка Людміла, *Быт і культура беларусаў Латвіі як праблема этнаграфічнага даследавання* [у:] *Беларусіка=Albaruthenica 6. Беларусь паміж Усходам і Захадам: Праблемы міжнацыянальнага, міжрэлігійнага і міжкультурнага ўзаемадзеяння, дыялогу і сінтэзу*, рэд. У. Ронфін і інш., Менск 1997, с. 240–244.

Мальдзіс Адам, *Лёс архіва К. Езавітава*, "Кантакты і дыялогі" 1996, № 7–8, с. 45–48.
Мірановіч Пётра, *Беларусы ў Латвіі*, "Запісы БІНіМ" 1978, № 16, с. 92–98.
Міхалюк Дарота, *Беларуская народная рэспубліка ў 1918–1920 гг. Ля вытокаў беларускай дзяржаўнасці*, Смаленск 2016.
Мядзёлка Паўліна, *Сцежкамі жыцця*, Менск 2018.
Мязга Мікалай, *Пазіцыя Польшчы адносна ўдзелу беларускай дэлегацыі ў савецка-польскіх мірных перамовах (жнівень 1920 – сакавік 1921 г.)*, "Rocznik Centrum Studiów Białoruskich" 2022, t. 8, s. 66–73.
Найдзюк Язэп, Касяк Іван, *Беларусь учора й сяньня*, Менск 1993.
Павлова Татьяна, *Дипломатия БНР в 1918–1925 гг.* [в:] *Внешняя политика Беларуси в исторической ретроспективе*, Минск 2002.
Петровский Юрий, *Церковный историк Сергей Сахаров* [в:] *Призвание – краевед: По материалам X Давгавпилсской краеведческой конференции*, ред. В. Филипов, Даугавпилс 2013, с. 5–14.
Петроченко Ксения, *Русская диаспора в Латвийской Республике:1918–1940 гг.*, Автореферат на соискание научной степени кандидата исторических навук, Новосибирск 2006.
Раўнейка Святлана, *Беларуская дыяспара ў Рызе ў пачатку XX ст. (па матэрыялах даследавання К. Езавітава)* [у:] *Айчынная і сусветная гісторыя: сучасныя погляды і метады даследаванняў: Зб. навук. прац: У 2 ч. Ч. 2: Актуальныя пытанні ўсеагульнай гісторыі і гісторыі Беларусі*, Менск 2003, с. 202–207.
Раўнейка Святлана, *Беларуская меншасць у Латвіі ў 20-х – пачатку 30-х гг. ст. (па матэрыялах даследавання К. Езавітава)* [у:] *Айчынная і сусветная гісторыя: сучасныя погляды і метады даследавання. Зборнік навуковых прац. У 2 ч. Ч. 1. Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі*, Менск 2002, с. 125–130.
Раўнейка Святлана, *Канстанцін Езавітаў: жыццёвы шлях і дзейнасць*, Аўтарэферат на суісканне навуковай ступені кандыдата гістарычных навук, Менск 2003.
Раўнейка Святлана, *Канстанцін Езавітаў: імя, якое вяртаецца ў гісторыю* [у:] *III межвузовская научно-методическая конференция молодых ученых: Сб. материалов (13–15 июня 2001 г.)*, Брест 2001, с. 62–63.
Раўнейка Святлана, *Лёс бібліятэкі Канстанціна Езавітава* [у:] *IV межвузовская научно-методическая конференция молодых ученых (15–17 мая 2002 г.). Сборник материалов*, Брест 2002, с. 87–88.
Раўнейка Святлана, *Некаторыя аспекты гісторыі Беларусі ў даследаваннях К. Езавітава* [у:] *Славянскі свет: мінулае і сучаснасць: Матэрыялы Рэсп. навук. канф., 26 сакавіка 2004 г.*, рэд. А. Жутко, ч. 2, Менск 2004, с. 82–86.
Раўнейка Святлана, *Педагагічна-асветніцкая дзейнасць К. Езавітава* [у:] *III межвузовская научно-методическая конференция молодых ученых (12–15 июня 2001 г.). Сборник материалов*, Брест 2001, с. 64–65.
Раўнейка Святлана, *Тайна гібелі Канстанціна Езавітава* [у:] *V межвузовская научно-методическая конференция молодых ученых (29–30 мая 2002 г.). Сборник материалов*, Брест 2003, с. 191.
Рудовіч Станіслаў, *Час выбару: Праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 г.*, Менск 2001.
Сапунов Алексей, *Инфлянты. Исторические судьбы края, известного под названием Польских Инфлянт (Витебск 1886)* [в:] *Памятная книжка Витебской губернии на 1887 год*, Витебск 1887.
Сахарава Вольга, Сахараў Сяргей, *Выбраныя творы*, рэд. М. Казлоўскі, С. Панізьнік, Менск 2015.

Сіцько Сцяпан, *Дзесяцігодзьдзе 1-ае Рыжскае беларускае аснаўное школы, 1923–1933*, прадм.: К. Езавітаў, Рыга 1934.

Слука Надзея, *Часопісы беларускай эміграцыі ў Латвіі ў міжваенны перыяд (на аснове фондаў аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі)* [у:] *Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі*, Менск 2013, с. 189–195.

Слука Надзея, *Часопісы беларускай эміграцыі ў Латвіі ў міжваенны перыяд (на аснове фондаў аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі)* [у:] *Путь длиной в полстолетия: к 50-летию образования отдела редких книг и рукописей Центральной научной библиотеки им. Якуба Коласа НАН Беларуси*, сост. А.В. Стефанович, М.М. Лис, Минск 2015, с. 172–177.

Сокал Пятро, Казлоўская Валянціна, *Выбраныя творы*, рэд. М. Казлоўскі, С. Панізьнік, Менск 2016.

Статут Таварыства беларускіх вучыцялёў у Латвіі, Рыга 1927.

Сузор'е беларускага памежжа: беларусы і нараджэнцы Беларусі ў суседніх краінах: энцыклапедычны даведнік, рэд. А. Мальдзіс, Менск 2014.

Улашчык Мікалай, *Даць народу гісторыю. Успаміны, лісты*, Менск 2016.

Фейгмане Татьяна, *Русские общества в Латвии (1920–1940 гг.)*, Рига 1992.

Цвікевіч Аляксандр, *Збор твораў*. Т. 1. *Гістарычныя працы*, укл.: А.С. Ліс, рэд. Д.В. Віцько, прадм.: А.С. Горны, А.С. Ліс, Смаленск 2021.

Целеш Вячка, *Беларускія масткі ў Латвіі: 1920–1990*, Рыга 2020 [Ceļešs Vjačka, *Baltkrievu mākslinieki Latvijā: 1920–1990*, Rīgā 2020].

Целеш Вячка, *Нацыянальная школа як фактар захавання беларускай дыяспары ў Латвіі* [у:] *Беларусіка=Albaruthenica 6. Беларусь паміж Усходам і Захадам: Праблемы міжнацыянальнага, міжрэлігійнага і міжкультурнага ўзаемадзеяння, дыялогу і сінтэзу*, рэд. У. Конан і інш., Менск 1997, с. 244–248.

Ціхаміраў Аляксандр, *Беларусь у сістэме міжнародных адносін перыяду пасляваеннага ўладкавання Еўропы і польска-савецкай вайны (1918–1921 гг.)*, Менск 2003.

Цоя Сергей, *К истории русского образования в межвоенной Латвии (20–30-е годы XX в.)* [в:] *Альманах. Вып. XXXVI. Русский мир и Латвия: смена времен*, ред. С.А. Мазур, Рига 2014, с. 79–98.

Чарняўскі Аляксандр, *Выдавецкая дзейнасць беларускай нацыянальнай меншасці ў міжваеннай Латвіі (1918–1940 гг.)*, "Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Серыя 1. Гісторыя і археалогія. Філасофія. Паліталогія" 2023, т. 15, № 3, с. 58–72.

Чарняўскі Аляксандр, *Роля адукацыі ў культурна-асветніцкай дзейнасці беларускай нацыянальнай меншасці ў Латвіі (1918–1940 гг.)*, "Труды БГТУ. Серия: история, философия" 2023, № 1, с. 66–72.

Чернякевич Андрей, *БНР: Триумф побежденных*, Минск 2018.

Шидловская Ольга, *Николай Талерко – белорусский самородок Латгалии*, "Латыши и беларусы: вместе сквозь века" 2018, № 7, с. 72–76.

Юркевіч Юрый, *Стварэнне і дзейнасць Асобнага атрада БНР у Балтыі* [у:] *Балахоўцы. Сведчанні. Дакументы. Даследаванні*, 2-у выданне, пераклад, прадмова і каментары А. Вашкевіч, А. Чарнякевіч, Ю. Юркевіч, Смаленск 2014, с. 25–158.

Юрэвіч Лявон, *Беларуская мемуарыстыка на эміграцыі*, Менск 2005.

Юрэвіч Лявон, *Шматгалосы эпісталярыум. Гісторыя людзей і ідэй на эміграцыі ў ліставанні*, Менск 2012.

Якобсонс Эрикс (Jēkabsons Ēriks, Екабсонс Эрыкс), *Выходцы с Гродненщины в общественно-политической жизни белорусов Латвии в 20–30-е г. XX в.* [в:] *Культура Гродзенскага раёну: праблемы развіцця ва ўмовах поліэтнічнага сумежжа. Зборнік навуковых прац*, Гародня 2003, с. 150–155.

Янковяк Міраслаў, *Роля беларушчыны ў фарміраванні тоеснасці беларускамоўных жыхароў паўднёва-ўсходняй Латвіі і іх адносіны да іншых моў і гаворак*, "Латыши и белорусы: вместе сквозь века" 2017, № 6, с. 111–119.

Указальнік імёнаў

А

Абалевіч, Антон 373, 375, 379
Абалевіч, Ян 705
Абрантовіч, Фабіян 788
Абуховіч, Альгерд 573
Абэрбер, Ян 545
Адамовіч, Вячаслаў "Дзяргач" 885
Адамовічс, Людвігс Эрнэстс 846
Адахоўскі, Уладзіслаў 878
Азоліньш, Лукс 172, 173, 293
Азоліньш, Аляксандрс 494, 496, 603
Азоліньш, Канстанцінс 597
Азоліньш, Петэрыс 252, 315
Акерман 698
Акінчыц, Фабіян 889, 891, 892
Александровіч 257
Александровіч, Канстанцін 151, 172, 173, 192, 202, 221, 325, 369, 370,372, 373, 375, 379, 380, 381, 384, 473, 476, 535, 540-542, 586, 705, 720, 861
Александровіч (Габран), Люцыя 512, 850
Александровіч, Юлія 385
Альбін, Януш 13, 103, 143
Альгерд 499
Альхоўка, М. 351
Альхоўскі, Яўген 598
Альшэўскі, Антон 160, 311, 515, 539, 550, 578, 787-788, 790
Аляксеева, Вольга 356, 360, 822
Аляхновіч, Францішак 146, 218, 358, 360, 363, 368, 405, 422, 463, 464, 470, 520, 573, 576, 583, 608, 893
Андрушонак, Таіса 606
Анжэ 580
Анісімаў 811
Анспок, Алаіза 518, 601
Антаневіч, Альфонс 498, 634
Антонава, Кацярына 671
Антонаў, К. 151, 251
Апанасёнак, Васіль 160
Апанасёнак, Яфім 388
Апанасёнак, Максім 705
Апіня, Ілга 12, 366, 386, 904, 914
Арлова, Манда 266
Арлоў, Аляксей 221, 246, 257, 264, 266
Арсеннева, Наталля 532
Арцімовіч, Вікенцій 707
Арэ, Карліс 496-498
Асанаў, Э. 315, 317
Астроўскі, Радаслаў 532, 691
Астроўскі, Феліцыян 183, 187, 198, 201, 321, 327, 338, 339, 348, 473, 478, 543,
Аўсянік, Антон 93

Б

Багачоў, Аляксандр 697, 715
Багаяўленскі, Рыгор 602, 603, 860
Багданаў 76

Багдановіч, Г. 366
Багдановіч, Т. 366
Багдановіч, Войцех 366
Багдановіч, Максім 532
Багдановіч, Ян 365
Багінская, Клара 192, 303, 586
Багушэвіч, Францішак (Мацей Бурачок) 197, 520, 531, 555, 573, 579, 585, 893, 897
Бадунова, Палута 89, 92, 667
Байкоў, Мікалай 472, 532
Байкоўскі, Мікалай 707, 708
Байкоўскі, Міхал 705
Балодзіс, Карліс 304
Балодзіс, Яніс 58, 888
Банк, Рыва 606
Банк, Зэльда-Рая 606
Бараноўскі, М. 803
Бараноўскі, Уладзімір 671
Барданос, М. 438, 722
Баркоўскі, А. 736
Бароўская, Вольга 161, 386, 616, 619, 622, 626, 668, 676, 729, 914
Бароўская-Пігулеўская, Вольга 352-354, 356, 357, 359, 360, 364, 365-367, 372, 608, 799, 847, 851, 897
Бароўскі 897
Барткевіч, Аляксей 248, 325, 348, 371, 371, 388-390, 419, 425, 442, 487, 488, 512, 513, 517, 535, 540, 542, 550, 555, 558, 567, 580, 591, 596, 600, 674, 731, 745-747, 750, 788, 848, 867, 884
Бартуль, Яўген 447, 688
Баршчэўскі, Ян 510
Барысовіч, Васіль 680, 681
Барысовіч, Феафан 266
Баторый, Стэфан 413, 635, 688, 766, 909
Башко, Пётр 497
Бедарава, Вольга 353, 355, 357,
Бедарава, Ганна 261, 364, 385, 410, 608, 850, 851, 902
Белікаў, Іван 142, 183
Белюц, Франц 554
Бергіс, Петэрыс 71
Бергман, Эльза-Эмілія 560, 858
Бергс, Арведс 315
Берзіньш, Робертс 159
Бермонт-Авалаў, Павел 48, 57, 63, 639
Берт, Альфрэд 49
Бікоўскі, В. 594
Біржышка, Міколас 397, 684
Блажэвіч, Баляслаў 338, 849
Блажэвіч, Павел 694
Блаўман, Рудольф 358, 365, 367
Блашчак, Томаш 683
Блезе, Эрнэстс 300
Блодніекс, Адольфс 843
Борман, О. 370
Борык, Антон 69, 83
Боўфал, Браніслаў 51, 52, 60, 61
Брадоўскі 664
Брач, Юлій 602, 868
Брудная, Шэйна 575, 576
Брушцін, Хая 606
Брык, Андрэй 780
Брэдэрман, Бірута 518, 642, 861
Брэжга 312
Брэжга, Баляслаў 387, 397, 442, 369, 586
Будзька, Эдвард 36, 37, 141, 143, 146, 189-1192, 227, 242, 685, 902
Будоўскіс, Яніс 312
Буйло, Канстанцыя 304, 573
Бука, Бенедыкт Віктар 328
Булак-Балаховіч, Станіслаў 54-56, 58, 60, 61, 8, 916
Булат, Аляксандр 338, 610, 705, 707, 708
Булаўская, Ганна 779
Булаўская, Л. 360
Булаўскі, Мікалай 547
Бурс, Юрыс дэ 363, 364
Бядуля, Змітрок 573, 630, 633, 664

В

Вазнясенскі Веніямін 822, 827
Вайводзіш, Эдвард 198, 235, 288, 301, 305, 327, 339, 342, 366, 392, 467, 513, 559, 586, 707, 713, 714, 789
Вайноўская, Марыя 428, 442
Вайноўскі, Алесь 634, 649, 650
Вайноўскі, Пятро 337, 362, 705
Вайткевіч, Баляслаў 563
Вайцюлевіч, В. 469, 471
Валогін, Мікалай 496
Валькевіч 684

Вальковіч, Аляксандр 45, 66, 81, 89, 90, 92-94, 97, 698
Вальтар, Віктар 342, 395, 423, 500, 451, 463, 669, 470, 674, 675, 709, 779, 839, 902
Ванаг, Аляксандр 515
Ваньковіч, Мельхіёр 877
Варажун, Максім 144, 824
Варонка, Язэп 63, 89, 94, 227, 438, 439, 675, 676, 717
Васілеўская-Казека, Стэфанія 175, 203,
Васілеўская, Юзэфа 269, 356, 357, 549
Васілеўскі, Леон 93, 95, 664
Васільеў, А. 143, 283, 315,
Васільеў, Тамаш 669, 674
Васільева, Вольга 142, 150, 283, 311
Васілянін, Міхаіл 348
Вевэрбрантс, Арнольдс 495, 496, 522
Вежбіцкі, Антон 792, 830, 831
Вігуль 408
Відаўскі, Уладзімір 271, 452, 457, 487, 560, 563, 578, 664, 859
Вільдэ 462
Вільпшэўскі, Ян 693
Вільпшэўскі, Яраслаў 715, 783
Вільчынскі, Э. 518
Віткоўскі, Раман 410, 414
Вітушка, Аляксандр 413
Войцікава 641
Воркуль, Якуб 271, 319, 355, 430, 442, 463, 467, 498, 902
Восіпаў, Рыгор 569
Высокіх, Алена 160, 224
Высоцкіх, Уладзімір 198
Вяршынін, Мікола 36, 227, 395, 396, 433, 469, 655, 663, 664, 668, 669, 671
Вярыга, А. 509
Вэнт, Павел 45
Вяжбіцкі, Ян 700, 701

Г

Габран (у замужжы: Александровіч), Люцыя 193, 194, 221, 301, 305, 473, 774, 914
Габранава, Юлія 10, 428,
Гаварс, Тэкля 858
Гадлеўскі ,Аляксей 266, 509, 535
Гадлеўскі, Вінцэнт 788
Гайданаў, В. 584
Гайлевіч, Язэп 311, 342, 348, 420, 447, 518, 560, 562, 564, 591, 787, 788
Гайліт (Гайліта), Вольга 160, 515
Галавінскі, Аляксандр 91, 93, 94, 188, 227
Галавінскі, У. 629
Галер Юзаф 58
Галубок, Уладзіслаў 218, 360, 394, 405, 570, 573, 609
Галынец, Алесь (Цвікевіч, Аляксандр) 432, 467, 470, 914
Гананьш, Тэкля 560
Гарбачонак, Антаніна 356, 360, 554
Гарбачонак, Станіслаў 365
Гартны, Цішка 531, 555, 630, 631, 632
Гарун, Алесь 197, 520, 573
Гарэлік, Ю. 432
Гарэцкі, Гаўрыла 218, 219
Гарэцкі, Максім 185, 190, 218, 227, 472, 492, 532, 573, 578, 644
Гелрайціс, Баліс 740
Герасімава, Валянціна 10
Герасімаў, Пётр 671, 674
Гербер, Г. 45
Германовіч, Язэп 788
Гірсанаў, Ю. 357
Глаголеў, Уладзімір 560
Гладкая, Караліна 668
Гладкі, Юрый 81
Гладкова, П. 373
Гладкова, Таццяна 375, 381
Глекнэ, Алекс 198
Голдманіс, Марыс 12
Голубева, Наталля 10
Голубеў 588
Гогаль, Мікалай 583
Грабоўскі, Я. 472
Гросэн, Генрых 602
Грох, Міраслаў 26, 28
Груздзеўскі 45
Грундуліс, Аляксандра 560, 561
Грыб, Тамаш 84, 307, 308, 433, 455, 563, 667, 909
Грыгаровіч, М. 896
Грыгароўскі 601
Грыгор'еў 269

Грынберг, О. 732
Грыневіч 664
Грыўскі, Міхаіл 361, 422, 515, 518, 555, 603, 860, 862
Гурло, Алесь 573
Гуртыньш, Алфрэдс 784
Гусарэвіч, Уладзімір 337, 341, 343, 353, 362, 364, 365, 367, 369, 407, 499, 500, 594, 600, 680, 682, 683, 732, 850, 851
Гушча, Т. 150

Д
Дабравольскі 296
Далецкі, Данат 504, 750
Даль, Марыя 364, 854, 894
Даль, Юзэфа 515, 850
Дамброўскі, Мікола 554
Дамброўскі, Я. 447
Дамброўскі-Думбрайс, Ф. 868
Даніловіч, Браніслаў 883, 893, 915
Данілюк, Якуб 67, 83, 86
Данон, Язэп 37
Дарафееў, М. 251
Дарафееў, Сымон 261, 673
Даўгэ, Аляксандрс 180, 250
Даўгяла, Змітро 464, 470
Даўкстэ, Г. 369
Даўкшта, Баляслаў 902
Дварчанін, Ігнат 187, 188, 190, 227, 343, 387, 655, 668
Дварэцкі, Аўгуст 143, 182, 229, 323, 338, 342, 485, 528, 707, 747, 751
Дварэцкі, Мікалай 683
Дзервінка 820
Дзяменцьеў, Пятро 142, 143
Дзямідава, Алена 219, 232
Дзямідава, Вольга 340
Дзямідаў, Мікалай 15, 160, 288, 324, 335, 341, 352, 353, 360, 367, 407, 419, 445, 460, 473, 482, 485, 491-494, 516-518, 543, 544, 556-559, 578, 579, 609, 624, 628, 642, 649, 682, 685, 728, 730, 759, 851, 856, 867, 85-887, 890, 892, 893, 896, 914
Дзянікін, Антон 49
Дзяргач, Ксаверы 748
Дзяргач, Віктар 164, 198, 201, 217, 241, 473, 789, 854
Доўгая, Вікторыя 353, 355, 357, 360, 364, 365, 367, 368, 388, 390, 495, 500, 518, 578, 602,-604, 710, 850, 851, 860
Доўгая, Марыя 495
Доўгі, Антон 360, 365
Доўгі, Браніслаў 268, 720
Доўгі, Станіслаў 360
Доўгі, Янка 269, 271, 564, 634, 649, 650, 850
Доўнар-Запольскі, Мітрафан 306 49, 303, 311, 837
Дрыслёнак, Пятро 598
Дубавік, Канстанцін 221, 288, 447, 528, 538, 541, 543, 645
Дубовік, Уладзімір 234
Дубровіч, А. 45
Дударэнка, Якаў 516
Дуж-Душэўскі, Клаўдзій 48, 51, 53, 54-56, 64, 74, 88, 94, 580, 677, 680, 681-683
Дундар, Пятро 554
Дыла, Язэп 664
Дынабургскі, Серафім 410, 412, 585, 866

Е
Езавітава, Мацільда 461
Езавітаў, Барыс Ануфрыевіч 651
Езавітаў, Барыс Барысавіч 650
Езавітаў, Канстанцін 8-10, 12, 14-18, 21, 28, 33, 34, 37, 38, 44-99, 101, 115, 116, 119, 121, 122, 130, 174, 183, 188, 189, 194, 210, 215, 217, 228, 232, 249, 253, 254, 263, 271, 282, 283, 292, 304, 310, 311, 312, 313, 315, 316, 318, 321, 327, 329, 336, 358, 359, 366, 369, 373, 387, 388, 396, 397, 399, 400, 417, 425, 438, 440, 441, 442, 447, 448, 457, 461, 463, 466, 467, 468, 469, 470, 471, 485, 486, 529, 541, 543, 587, 593, 617, 618, 620, 624, 626, 627, 628, 630, 632, 634, 639, 640, 642, 643, 644, 650, 652, 664, 666, 677, 679, 680, 681, 689, 710, 740, 741, 745, 746, 789, 819, 854, 895.
Екабсонс, Эрыкс 12, 31, 40
Елізарава (Маціеўская), Зоя 414
Емяльянаў, Кірыла 198
Ермачэнка, Іван 18, 273

Ж
Жалігоўскі, Люцыян 40, 88, 95, 97
Жамяркова, Алена 668
Жданко, Раіса 203, 311, 509, 543, 546
Ждановіч 664
Жданоўскі, М. 594
Жукава (Жукава-Лейтан), Ганна 357, 360, 865
Жук-Грышкевіч, Вінцэнт 675
Жукоўскі, Пятро 543, 546
Журкоўскі, Пятро 355, 401, 410, 414, 428, 442, 451, 455, 457, 463, 482, 484, 485, 489, 508, 538, 546, 559, 564, 590, 600, 603, 680, 688, 752-759, 852, 854, 856, 866, 902
Жылка, Уладзімір 254
Жылуновіч, Зміцер 36, 439, 628, 630, 636-638, 641, 659, 664, 738
Жэмерава, Алена 674
Жэрдзі, Парфіры 187, 229, 250, 252, 258, 259, 301, 312, 319, 321, 323, 339, 351-353, 360, 365, 367, 369, 420, 423, 475-499, 504, 558, 559-564, 572, 583, 584, 594, 602, 657, 734, 746, 756, 862

З
Завадскі, Ігнат 750
Залітыс, Петэрыс 274, 275, 473
Заліўскі, А. 366
Заліўская, Лідзія 327
Заліўскі, Нікан 828
Заліўскі, Пятро 598
Заліўскі, Сцяпан 146
Заморын, Міхаіл 561, 563
Зарыньш, Рыхард 79
Зарэцкі, Міхась 573, 631
Захарава, Марыя 543, 821, 823
Захарка, Васіль 18, 89, 90, 93, 94, 97, 283, 289, 396, 654, 655, 661-664, 673, 678, 681-683, 702, 883-885, 889
Зацкі, Міхал 359
Заяс, Кшыштаф 136 25, 36
Заяц, Лявон 54, 659
Зінкевіч, Вільгельм 183, 250, 251, 262, 319, 321, 369, 561, 562, 564, 571, 714
Злоцкі, Рыгор 45, 81
Зонбергс, Вальдэмарс 882
Зорыньш, Данат 895, 897
Зуеўскі, Міхась 393, 401, 408
Зуземіль, Эдмунд 400
Зэйгліш, Афінаген 413, 684
Зэйгліш, Кацярына 273, 319, 356, 360, 362, 503,
Зэйгліш, Янка 369, 422, 535, 555, 586

І
Іванова, Алена 467
Іванова, Раіса 894
Іваноў, Барыс 356, 360, 271, 356
Іваноў, Мікола 201
Іваноў, Міхал 34, 144, 175, 203, 246, 266, 269, 295, 301, 301, 304, 312, 313, 333, 422, 509, 546, 609, 657, 694, 705, 773
Іваноўскі, Вацлаў 395
Ігнатовіч, Ігнат 393, 747
Ігнатоўскі, Усевалад 209, 228, 304, 343, 492, 531, 532, 580, 631, 633, 664
Ісрык, Язэп 748
Ісьемін, Іцык 264

К
Кабякоў, Дзмітры 67, 81
Каганец, Карусь 150, 520, 573, 583
Кадоўба Даніла 45
Казак-Казакевіч, Эмілія 500, 521, 847, 861
Казакевіч, Караль (Карл) 339, 362, 363-368, 401, 412, 447, 682, 861
Казачонак, Аляксандр 379, 382,
Казачонак, Валерыя 598
Казачонак, Кацярына 12, 756
Казека, Сяргей 203, 227, 228, 229, 246, 251, 266-275, 292, 295, 301, 308, 323, 341, 351, 355, 361, 388, 390, 393, 406, 421, 442, 464, 484, 487, 488, 505, 509, 510, 527, 546, 550, 552, 581, 604, 644, 709, 739, 747, 752, 866, 867
Казлоў, Уладзімір
Казлоўская, Валянціна (Лясная Кветка) 11, 268, 270, 296, 311, 328, 412, 442, 467, 584, 585, 634, 649, 650, 902,
Казлоўская, Марыя 814
Казлоўскі, Аляксандр 563
Казлоўскі, Вільгельм 561,
Казлоўскі, Данат 413, 484, 511, 512, 543, 586, 734,

Казлоўскі, Даніла 242, 269,
Казлоўскі, Уладзіслаў 691
Казюра, Сяргей 435, 620, 622, 623, 626
Казячы, Рыгор 45, 62, 67, 68, 81, 86-89, 456
Кайраў, Пётр 447
Кайрыс, Сцяпонас 395
Калашнікаў, Уладзімір 250, 561
Калбека, Ян 669
Калейс, Оскар 561, 597
Каліна, М. 474
Каліна, Кастусь 648
Калінін, Міхась 268, 271, 353, 355-357, 362-267, 401, 408, 410, 413, 442, 447, 500, 564, 585, 593, 594, 759, 838, 850, 851, 902
Каліноўскі, Канстанцін 358
Калістратаў, Мілецій 238, 622, 697
Кальмакоў, Фёдар 337
Кальмановіч, С. 45
Кальніньш, Яніс 511, 560, 561, 563
Каляда, Фелікс 164, 198
Камаржынскі, Язэп 146, 172, 187, 192, 242, 269, 327, 341, 342, 353, 359, 360, 362, 363-367, 384, 390, 412, 422, 464, 473, 515, 799, 850, 851, 854, 894,-897, 902
Камінскі, В. 39
Камянецкі, Вітальд 95
Канапацкі, Хасан 60
Кандратовіч, Кіпрыян 42
Каплан, Абрам 606
Каплан, Берта 674
Каплан, Мозус 607
Капылоў, Васіль 720
Капылоў, Віктар 634
Капылоў, Павел 561, 597
Карабач, Алесь 89, 217, 658
Каралюк 170
Караткевіч, В. 366
Карнавухава, Кацярына 375, 379
Карнавухава, Сафія 535
Карнавухаў, Ян (педагог) 263, 560, 561, 600, 671
Карнавухаў, Ян (студэнт) 672
Кароль, Алена 881
Кароль, Язэп 881
Карскі, Яўхім 25, 185, 304, 395, 834
Карэцкі, Пётр 475, 806
Каспар, М. 45, 67
Каспяровіч, Марыя 333, 372, 375, 387, 486, 543,671, 739,848, 866
Каспяровіч, Мікалай 343, 379
Кастылюк, Якуб 142, 250, 251, 301, 339, 341, 348, 351, 365, 388, 390, 420-423, 451, 453, 481-504, 522, 528, 535, 540-550, 558-562, 589, 602-609, 680, 682, 683, 697, 730, 732, 739, 778, 780, 821, 823, 839, 850, 862, 866, 902
Катоўскі, Ян (Іван) 369, 378, 560, 561, 563, 858
Катышаў, Віктар 198
Какановіч, Міхал 217, 636, 640
Качубаеў, Якаў 373
Каяла, Язэп 353, 390, 401, 452, 515, 555, 851, 895,897
Каяла, Ян 364 365
Квачова, Паўліна 375
Квачова, Пелагея 333, 360
Квэст, Лявон (Леў) 705,707
Келер, Казімір 13
Кельнэ, Марта 860
Кеніньш, Атыс 593,757
Кільян, Максімільян 561, 563, 822
Кісялёўскі, В. 399
Клагіш, Антон 487, 488, 586
Клагіш, Данат 705, 711, 778
Клагіш (Тэтар), Люцыя 148, 160, 337, 352, 353, 412, 446, 483, 517, 523, 627, 703, 707
Клагіш, Міхал 341, 707, 748, 750
Клагіш, Франц 192, 341, 390, 393, 401, 405, 450, 457, 463, 598, 603, 604, 669, 674, 682, 748, 759, 860, 902
Клагіш, Часлаў 447, 559, 705, 748
Клагіш, Язэп 258, 338, 341, 390, 401, 404, 408, 412, 413, 584, 586, 602, 604, 688, 705, 713, 734, 748, 759, 778, 849, 860, 866, 896,902
Клімовіч, Адольф 399, 689
Клявінь, Пётр 164, 221, 232, 234, 811, 819
Кляменцьева, Я. 447
Кован, Уолтэр 49
Колас, Якуб 10, 197, 335, 394, 460, 520, 531, 532, 556, 573, 579, 582-585, 609, 629, 630, 633, 664, 687
Комісарс, Яніс 250, 259, 260, 410, 561, 563
Копец, Багдан 881

Корці, Уладзімір 143, 234, 235, 246, 250-255, 279, 287, 292, 301, 310-317, 657, 658, 855, 890, 892
Корчак-Крыніца-Васількоўскі, Алег 52, 53
Костачка, Нікіфар 400
Краскоўская, Людміла 254, 261, 313, 457, 600, 671, 672, 674
Краскоўскі, Вячаслаў 570
Краскоўскі, Іван 14, 17, 143, 182, 183, 209, 214, 220, 227, 229, 233, 243, 249-264, 279-325, 418, 475, 579, 581, 600, 613, 616, 626, 628, 655-658, 670-674, 685, 807, 902
Краскоўскі, Сяргей 570
Краснайс, Вілбертс 11, 863
Красневіч, Станіслаў 123, 150, 251, 342, 353, 409, 442, 473-481, 517, 518, 549, 559, 702, 705, 707, 734
Красневіч, Яўген 187,
Красцьянцава, Домна 221
Красцьянцаў, Еўдакім 221, 403, 447
Краўцоў, Макар 387, 584
Краўчанка, Міхась 150, 197, 341, 342, 356, 359, 360, 381, 388, 390, 394, 412, 422, 489,515, 586, 601, 854, 866, 895, 896
Краўчанка, Сцяпан 360, 372, 375, 379, 381,
Краўчанка, Я. 518
Кроман, Антон 364
Кронбергс (Кронберг), Аляксандрс 181, 337
Крум, Аляксей 57
Крупенкаў, Павел 694
Крупскі 747
Крэйц, Анастасія 355, 360, 361, 364-367, 422, 515, 851, 854, 866
Крэйц, Варвара 355
Крэйц, Рыгор 356
Кудраўцова, Ганна. 364, 500
Кудраўцова, Сафія 192, 231
Кудраўцоў, Сяргей
Кудраўцоў, Ян 271, 269, 296, 319, 360, 365, 390, 431, 345, 353, 364,365, 407, 408, 487, 489, 518, 555, 850-853, 854
Кузняцова, Таццяна 12
Кукель, Язэп 896, 897
Кунцан 512
Купала, Янка 146, 180, 197, 260, 261, 269, 335, 357, 360, 374, 394, 405, 407, 520, 531, 556, 573, 580-583, 609, 630-633, 642, 650, 687, 851, 868
Купцэвіч, Фелікс 619, 624, 625
Курці-Куршынскі (Курцыйс-Куршынскіс), А. 640, 642
Кухта, Аляксей 878
Кэмпс, Франціс 136, 137, 215, 264, 265, 714, 805, 806

Л

Ладноў, Яўген 90, 395
Лазаронак Васіль 341, 514
Лазаронак Марыя 514
Лапаценка, Антон 391
Лапацёнак, Антон 271, 858
Ласіс, Альбіна 198
Ластоўская, Станіслава 291, 308
Ластоўскі, Вацлаў 36, 37, 51-98, 139-145, 188, 282, 290, 292, 299, 309-311, 352, 428-436, 442, 472, 586, 629, 650-694, 723
Латонас-Дзямідава, Анэля 385, 3386, 557
Лаўрыновіч, Пётр 515, 760
Лебядок П. 447
Левін Э 87, 442, 709
Лейтан, Антон 271, 319, 356, 360, 393, 405, 467, 498, 514, 865
Лейтэн-Рудзіт В. 860
Лейчман, А. 641
Лельмож 811
Ленава, Мары 198
Ленаў, Юры (Георгі) 198, 674
Ленін, У. 632
Лечман, М. 352, 866
Лёсік, Антон 388
Лёсік Язэп 64, 218, 460, 461, 469, 472, 532, 664
Ліпгард, М. 160
Ліпень, Алена 530, 585
Ліс, Марына 10
Локс, Мая 861
Лугоўскі, М. 251
Лугоўскі, Сяргей 674
Лукашэвіч, А. 360
Лукіньш, Аўгустс 302, 303, 312, 317
Луцкевіч, Антон 41, 48, 49, 54, 55, 62-66, 80, 218, 281, 332, 343, 400, 443, 452, 461,

469, 531, 580, 581, 586, 627, 686-689, 691, 740, 744, 887
Луцкевіч, Іван 17, 36
Луцкі, К. 365
Луцкі, Міхал 672
Любчын, Язэп 675
Лютэрман, Надзея 561
Ляховіч, Міхась 45, 59, 67
Ляхоўскі, Уладзімір 10, 19

М

Мадзялеўская, А. 255
Мадзялеўская, Зінаіда 256, 360, 363, 365, 379
Мадзялеўская, Марыя 356
Мадзялеўскі, Лявон 198, 669
Макаруха, Масей 357
Макаруха, Міхаіл 375, 379
Макарэвіч, Віталь 19
Макарэвіч, Я. 37
Максімава, Вольга 375, 379
Максімаў, Мікалай 379
Македонскі, Мікалай 160, 515, 518, 829, 861
Малаток, Ян 598
Малішэўскі, Эдвард 13, 768
Малько, Міхась 146
Мамантаў, Якаў 367
Мамонька, Язэп 37, 38, 73, 89-94, 661, 667
Мантойфель, Густаў 13, 24
Маразовіч, Янка 586
Маргентау, Генры 52
Маргуліес, Мануіл 52
Маркевіч, Міхась 45, 46, 86, 92
Маркоўская, Еўфрасіння 542, 543
Марозава, Кацярына 247
Марук, Янка 640
Масальскі, Ігнат 78
Масальскі, Пятро 197, 270-273, 337, 341, 352, 353, 360, 363-372, 385, 386, 390, 401, 442, 452, 462, 465-471, 500, 534-551, 586, 594, 609, 610, 725, 730, 731, 735, 850, 851, 902
Масарык, Томаш 557
Маслоўскі, Аляксей 447, 570
Матач, Антон 399
Матач, Мікола 396
Матыяш, Ірына 14
Матэас (Матэас-Краўзэ), Вера 369, 561, 563
Маціеўская, Кацярына 514
Маціеўскі, Сымон 182, 375, 379, 381, 387, 388, 393, 413, 464, 478-484, 533, 549
Мацкевіч, Станіслаў 748
Махноўскі, Алесь 187, 192, 193, 254, 263, 301, 305, 311, 338, 342, 352, 473, 475, 478, 500, 513, 528, 600, 671, 705, 902
Махноўскі, Сцяпан 198, 205, 241, 288, 293, 295, 481, 539, 705, 720,
Мацюшэнка, Г. 824
Мацьвіенка, М. 360, 363
Мачс, Эміль 495
Мееровіцс, Зігфрыдс 43, 44, 58, 93, 129, 131, 417, 656, 707
Мельнікаў, Людвік 369
Мельнікаў, Станіслаў 373, 375
Меншыкаў, Уладзімір 447
Мігленікс, Баляслаўс 697
Мікалаева (Мікалаева-Комісар), Надзея 260, 261, 299, 410, 412, 580, 590, 710, 897
Мікалюнас, Кацярына 269
Мікіраў 173
Мікула, Таісія 515, 861
Мілоўская (Мілоўская-Дыліс), Елізавета 671, 674
Мінкевіч, В. 468
Мінкін, Р. 819
Мінц 306
Мінчонак, Уладзімір 410-414, 602, 603
Мірановіч, А. 710
Мірановіч, Вільгельм 192, 399, 366, 541, 586
Мірановіч, Пятро 10, 327, 341, 345, 390, 401, 410, 412, 413, 337, 397, 557, 585, 600, 602, 603, 744, 829, 854, 860-862, 866, 868, 895-897, 902, 906
Міровіч 714, 785
Міровіч, Еўсцігней 358
Мітрас, Эльза 255
Мітрас, Эмілія 255
Мітрошчанка, Фрол 694
Міхайлоўская, Марыя 375
Міхайлоўскі, Уладзімір 40

Міхалюк, Дарота 14
Міхельсон, Л. 45
Младзяноўская, Паўля 73
Мурніек, Пётр 266
Мэндэ, Герхард фон 891, 893
Мядзёлка-Грыб, Паўліна 15, 143, 182, 190, 209, 220, 226-229, 233, 242-289, 295, 301, 309-313, 323-325, 418, 581, 583, 600, 613, 614, 625, 626, 650, 657, 658, 902
Мядзёлка, Зыгмунт 258, 600
Мяжэцкая, Алімпія 588
Мяжэцкая, Сабіна 360, 364, 773
Мяжэцкі, Дамінік 311, 351, 391, 422, 567, 588, 694, 707, 708, 896, 897
Мяжэцкі, Казімір 123, 341, 353, 355, 360, 365, 388, 401, 407-414, 422, 476, 481, 484, 580, 585, 598, 602, 603, 635, 849-854, 860, 861, 894, 902
Мяжэцкі, Язэп 271, 319, 360, 364, 499

Н
Навасёлаў, Ю. 220, 465, 471, 531, 534
Навіцкая, Францішка 710
Навіцкі, М. 160
Нагольма, Рамуальд 95
Найдзін, Аляксандр 340
Найдзёнаў, Уладзімір 67, 80, 81, 86
Найдзюк, Язэп 9, 101, 688, 691, 846
Натайла, Эфара 375
Наталко, Эдуард 379
Некрашэвіч, Сцяпан 388, 460, 632, 636, 650, 664
Неслухоўскі, Ян 573
Несэль, Альфрэд 49
Нібур, Уладзімір 674
Нікізін, Мікола 356, 360
Нікіфароўская, Галіна 197, 341, 342, 345, 388, 390, 393, 469, 500, 516-523, 586, 641, 642, 682, 861, 866
Нікіфароўская, Надзея 394
Нікіфароўскі, Васіль 514, 866
Нікіфароўскі, Канстанцін 670, 866
Нікіфароўскі, М. 897
Нікіцін, М. 360, 363
Нікрашэвіч, Канстанцін 570
Нікулін 821, 822
Нісель, Анры 49
Нойланд, Валянцін 607
Няміра, Вячаслаў 375

О
Обштэйн, Фрыдрых 594, 595, 597
Оруб, Вікенцій 570
Оруб, Франц 339, 356, 360-366,
Оруб, Ілля 366

П
Паберж, Себасцян 131, 311
Паберж, Юрыс 752
Падалевіч, Юзаф 38
Падлюбны, Ілля 645
Пажытноў, Канстанцін 347, 464, 469
Палуян, Сяргей 395
Пальчух, Язэп 892
Панамароў, Янка 430
Панізнік, Сяргей 11
Пантэвічс, Юрыс 560-563, 578
Панькоў, Мікола 447, 578, 644, 645, 896
Парваніцкі, Юльян 707
Парфееў, Агей 518, 554
Патмальніекс, Мікеліс 497
Паўлава, Марыя 495-498, 862
Паўлава, Таццяна 11
Паўлаў Аляксандар 671
Паўлаў, Фёдар 805
Паўлаў, Уладзімір 674
Паўлічэнка, Хведар 40
Паўловіч, Альберт 573
Паўловіч, Іван 694
Паўлоўскі, А. 271
Паўлоўскі, Ігнат 257
Паўлоўскі, Іпаліт 269, 636
Паўлюкевіч 662, 738.
Паўлюкевіч, Аляксандр 369, 560-562
Паўчэр, Пятро 76, 77, 143
Пашкевіч, Алаіза (Цётка) 197, 395
Пашкевіч, Алена 198
Пашкевіч, Алесь 19
Пашкевіч, Юзэфа 606
Пендзель, Генрык 228
Петрыньш, Франціс 296, 302
Петрэвіцс, Андрэйс 733
Петэрсанс, Аўгустын 173
Петэрсонс, Петэрыс 197, 602

Пігулеўскі, Уладзімір 86, 131,158, 159, 183, 198, 219, 220, 227, 234, 246, 250, 266, 279-301, 308-313, 319-322, 349-357, 365-368, 384, 405, 412-425, 439, 444, 450, 466, 470, 471, 477-506, 513-518, 523, 534-538, 544, 550, 552, 559, 580, 588-597, 613, 626-638, 650, 655, 689, 728-745, 759-761, 793, 794, 847, 848, 859, 862, 869, 884-888, 896
Пілсудскі, Юзаф 55, 60, 63, 93, 432, 762, 763
Пінская, Ніна 148, 181, 236, 242, 330, 337-341, 349, 357-364, 388, 400, 406, 411, 422, 428, 451, 457, 463-466, 476-489, 500, 580, 583, 584, 590, 703-707, 725, 734, 836, 866, 896
Піпіньш, Э. 464
Пічэта, Уладзімір 343, 631, 632
Платач, Віталь 694
Плескачэўскі, Аляксандр 680
Плоніс, Яніс 561, 859
Плыгаўка, Рыгор 130, 150, 159, 175, 182-187, 197-203, 228, 235, 246, 266, 274, 275, 292, 321, 322, 331, 341, 344, 348, 353, 357, 390, 417, 465, 473-495, 514-518, 522, 523, 535, 579, 593, 594, 609, 703-708, 725, 734, 807, 850-854, 861, 902
Пляўнэкс, Аляксандрс 495
Полацкая, Еўфрасіння 531
Померс, Іаан 743, 825
Прадцечанскі, Леанід 173, 697
Пракулевіч, Уладзімір 659
Праснякоў, Уладзімір 697, 805, 806
Пурыцкіс (Пурыцкі), Ёзас 97, 681
Пушкоўскі, Язэп 223, 605
Пушча, М. 648
Пырсікаў, Б. 251
Пырсікаў, Павел 251, 263, 333, 334, 379, 500, 600, 634
Пятроўскі Язэп 705, 707

Р

Радзевіч, Антон 498
Радкін, У. 251, 319, 476
Райкін, У. 476
Райко, А. 177, 348, 472-381, 420, 535, 540, 721, 732-737
Райко, Станіслаў 379
Райко, У. 576
Райніс, Яніс 90, 130, 135, 180, 250, 261, 311, 363, 365, 385, 418, 469, 577, 586, 629, 640, 655, 656, 693, 715, 730, 794
Рак-Міхайлоўскі, Сымон 189, 217, 378, 532
Раманаў, Ян 605
Раманаў, Юры 40
Раманавы 36, 315
Раманоўская, П. 360, 364
Раманоўскі 361, 789
Рамаш, Сцяпан 866, 894
Ранцанс, Язэпс 714, 716, 741, 754
Растаргуеў, Павел 399
Рафаловіч, Юзаф 562
Рацын, Віктар 192, 705
Рацын, М. 447
Рацын (Рацін), Станіслаў 364, 365, 567
Родзька, Аляксандр 148, 160, 196, 197, 331, 335, 352, 388, 390, 477, 478, 494-498, 522, 523, 593, 594, 601-604, 609, 703, 839, 860, 862, 867, 894-896, 902
Розенберг, Альфрэд 890, 892
Ромар, Раман 626
Рубеніс, Рудольфс 19
Рубульс, Уладзіслаў 697
Рудзіс, Яніс 496
Рудзь, Станіслаў 562
Руднікаў, Васіль 192, 266, 478, 548, 586, 699, 821
Ружанскі, Ежы 767
Ружанцоў, Алесь 433
Ружыцкі, Ежы 13, 700, 768
Рыдз-Сміглы, Эдвард 63
Рытаў, Аркадзь 360, 364, 367, 410, 412, 414, 499, 593
Рыціх, Аляксандр 24
Рэгут, Эмілія 254, 673
Рэчыс-Кальніньш, Ян 511

С

Савіцкі, Мікалай 707
Савіцкі, П. 705
Садоўскі, Георгий 248, 315
Сакалоў, Рыгор 668
Салаўёва, Антаніна 247, 548, 586
Салаўёва, С. 251, 257, 473
Салаўёў, Аркадзь 668, 674, 675

Салдашынскі, Аляксандр 606, 608
Сальцэвіч, Алесь 145, 342, 348, 357, 369, 370, 375, 393, 401, 420, 428, 500, 628, 667, 680, 723, 730-737, 848, 866, 902, 903, 914
Сангайла-Станевіч, Эмануіл 45, 81, 90, 865, 895
Сапега, Леў 582
Сапега, Мікіта 146, 283
Сапуноў, Аляксей 14
Сасноўская, Марыя 142
Саўкант, Сафія 379, 381, 559
Саўлас С. 646
Сахарава, Вольга 34, 580-583, 608
Сахарава, Ірына 610
Сахараў, Дзмітрый 363, 367, 447, 500
Сахараў, Сяргей 9-17, 34, 144-183, 191-201, 214-235, 243-262, 279-292, 301, 309-312, 318-322, 339-342, 350-375, 388-429, 442-504, 516, 535-551, 559-612, 620, 633, 635, 644-645, 673-676, 682, 684, 694-710, 720, 721, 730, 739-755, 777, 786, 787, 793, 807-812, 820, 827-847, 857-869, 882, 885, 895-902
Сваракоўскі, Вітольд 13, 769
Свэнэ 167, 783, 784, 814
Свэнэ, О. 465, 471
Серада, Іван 472
Сейле, Валерыя 168, 180, 250, 697, 805
Сідараў 296
Сільвановіч, Зоя 598
Сіман, Оскар 601, 602
Сітнік 507
Сітнік, Баляслаў 707
Сіцько, Сцяпан 9, 34, 119, 148, 150, 159, 160, 197, 227, 229, 266, 323, 331-345, 352, 360, 365, 367, 388, 390, 407-422, 460, 464, 470, 488-498, 515-517, 523, 601-609, 633, 680-683, 839, 850-854, 860-862, 884, 886, 902
Скабэл, Самфард Джон 48
Скадунс, Карліс 302
Скарына, Францішак 150, 455, 457, 531, 579, 609, 610
Скрыпка, Алесь 554
Скуеніекс, Маргерс 12, 135, 757, 843, 845
Слосман, Вераніка 401, 409, 410, 849, 853, 854, 902
Слосман, Мечыслаў 339, 341, 353, 356-367, 408, 500, 580, 851,
Слука, Надзея 918
Сметана, Бедржых 260
Смірнова 357
Смоліч, Аляксандра 460, 465, 470, 532
Смоліч, Аркадзь 63, 64, 218-220, 227, 295, 303-307, 313-316, 664
Сойкін 821
Сокал (Сакол), Пятро (Масальскі, Пятро) 11, 15, 270, 462, 467, 470, 650, 902
Сорын, Янка 780
Сотчанка, Міхал 694
Спрындзан 821
Сракоўскі, Канстанцін 794
Стакс, Метэрыс 337
Сталін, Іосіф 89, 648, 899
Сталяроў, Павел 197, 494
Стамкоўскі 221
Станкевіч 569
Станкевіч, Адам 142, 684
Станкевіч, Браніслаў 408, 500
Станкевіч, Ядвіга 221, 224, 231
Станкевіч, Язэп 150
Станкевіч, Янка 23, 218, 433, 532, 660, 835, 885-887, 891, 916
Старобінец, Берка 76
Стахоўскі, Уладзімір 878
Сташкевіч, Б. 535
Сташкевіч, К. 442
Страўберг, Карл 898
Строд 580
Стэймакоў, П. 183, 694
Стэпе 731
Стэфановіч, Сафія 250, 562
Стэфановіч, Эла 555
Сула, М. 780
Суслаў, Якаў 225, 226
Сушчыцкая, Алена 327
Сушынская, Алена 39, 301, 305
Сушынскі, Ігнат 748
Сушынскі, Язэп 38
Сцяпура, Антон 67, 81, 83, 90
Сянкевіч, Генрык 387
Сянкевіч, Казімір 347, 393, 518
Сяркоў, Фёдар 818, 837

Т
Таборэ 212, 789, 790
Тагабочны, І 366
Талбухін 828
Талентс, Стэфан 49
Талерка, Мікалай 13, 230, 242, 269, 295, 301, 305, 311, 327, 338, 339, 366, 387, 388, 393, 398, 473, 500, 584, 586, 705, 732, 735, 866, 902
Тамашыцкі, Лявон 270, 410, 427, 902
Танкель, Сымон 74
Тарасаў, С 39
Тарашкевіч, Браніслаў 63, 218, 227, 252, 378, 491, 532, 644, 690
Таўбін, Юлій 430
Тоўсцік, Станіслаў 748
Трасунс, Езупс 137, 806
Трасунс, Франціс 701, 710, 714, 716
Трубецкая (Трубяцкая), Аляксандра 369, 371, 375, 377, 562, 353, 369
Трубецкі 296
Трубецкі (Трубяцкі), М. 357, 359
Трубіцын, Сава 250, 319, 560, 562, 563, 585, 600, 829, 858
Трубіцын, Мікалай 571
Трубяцкі, А. 353, 357
Трубяцкі, Мікола 447
Трэйманс, Ансіс 562
Туманская, Ю. 365
Турская, Галіна 29
Тыран, Кацярына 412, 447
Тэраўскі, Уладзімір 260
Тэтар, Люцыя 338, 360, 364, 365, 483, 515, 594, 595, 687, 850, 851, 854, 897
Тэтар, Ян 148, 348, 446, 479, 480, 627, 659, 660, 707

У
Уласаў, Аляксандр 36
Ульманіс, Карліс 90, 693, 844-863, 870, 899, 905
Ульянаў, Аляксандр 616-626, 667, 668, 676, 729, 914
Упітс, Андрэйс (Упіт, Андрэй) 463, 470, 640
Упманіс, Я. 464

Ф
Фармакоў 173, 821
Фельдман, Зэльма 858
Фельдман, Ніна 173, 250,251, 257, 340, 562
Фельдман-Александровіч, Юлія 902
Фельдманіс, Юрыс 62
Фёдарава, Марыя 333, 369, 373, 473, 535, 541, 586, 848
Фёдарава, Юлія 562
Фёдараў, Ілля 257, 351, 369, 370-373, 375, 379, 381, 420, 476, 563, 577, 578, 705, 866
Фёдараў, Іван (Янка Маўр) 32
Фёдараў, С. 422
Фёдараў, Фінаген 535
Філатаў, Ян 669

Х
Харлап 671
Харлап, Марыя 311
Харлап, Ян 34, 142, 143, 248, 283
Харчэнкаў, Клімент 694
Хлебнікава, Вера 356, 360, 499, 533
Хмялеўскі, Мікалай 142, 143, 183, 283, 314
Холцманіс, Віліс 312
Хольсі, Рудольф 52
Хруцкі, Астап (Яўстах) 144, 212, 235, 361, 476, 514, 699, 827
Хруцкі, Павел 357, 360

Ц
Цаўнэ 405
Цвікевіч, Аляксандр 48, 55, 93-96, 145, 188, 289, 290, 304-317, 433, 467, 472, 632, 636, 655-661, 668, 679, 738, 739, 918
Цвяткоў, Пётр 45, 68, 81, 83, 688, 674, 675
Цемахаў, Юда 74
Цікота, Андрэй 788
Цімашонак, Восіп 705
Цімафеева, Ганна 365
Цімаховіч, Антон 306
Ціхаміраў, Андрэй 11,
Ціхаміраў Уладзімір 166, 167, 169, 206, 260, 342, 363, 369-381, 390, 395, 398, 560, 562, 575, 580, 595-598, 705, 730, 735, 737
Ціханенка, Уладзімір 694
Цішкевіч, Вячаслаў 339, 364
Цмок, Дзяніс 881

Цынарскі, Ян 767
Цынгель, Эдвард 598
Цэльяд, Густаў 369, 560, 562, 563, 572, 591, 599
Цярэшчанка, Кузьма 43, 44, 55, 67

Ч
Чакстэ, Яніс 84, 90, 97, 130, 253, 557, 585, 656
Чаманс, Язэпс 562, 597, 846
Чапля, Яўгенія 142
Чарамухін, Канстанцін 607
Чарапук, Янка 45, 54-62, 83, 86-94, 438, 615, 663-667, 675, 676, 717
Чарвякоў, Аляксандр 419, 438-442, 552, 630, 636, 638, 641, 667, 676, 732, 738, 740
Чарвякоў, Мікола 45, 53, 398, 642
Чаркоўскі, Аляксандр А 360, 363, 69
Чаркоўскі, Рыгор 694
Чарнабаева, Л. 518
Чарніховіч, Аляксандр 375, 379
Чарнуха, Дам'ян 338, 365
Чарных, Аляксей 439, 659, 718
Чарнякевіч, Андрэй 11
Чарняўская, Леаніла 218,
Чарняўская, Любоў 598
Чарняўскі, Аляксандр 10, 472
Чарняўскі, Елістрат 387 , 702, 705, 742
Чарот, Міхась 520, 531, 573, 630, 631, 650, 659
Чарткевіч, А. 447
Чыган, Лідзія 509
Чыжэвіч, Марыя 198, 224
Чэкст, Данат 748, 897
Чэкстэрс, Часлава 897
Чэркас, Павал 39

Ш
Шаберт, Мэрц 358, 359, 363
Шаберт, Ян 356, 358
Шаблоўская, Алена 160, 600
Шавялькоў, Леанід 674
Шанк, Дзяніс 53
Шанкат, Альберт 45
Шаўкоў, Раман 45, 71
Шаўлоўскі, Сігізмунд 395
Шаўцова, Ганна 364
Шаўцоў, Сцяпан 270, 274, 447
Шаўчэнка, Тарас 363
Шафрановіч, К. 379
Швабэ, Альбертс 62
Швангерадзэ, Ніна 603, 604, 860
Шварцбах, Алена 814
Шварцбах, Паўліс 560, 562, 563, 813, 818
Шкульцін, Аляксандр 266, 292, 348,562, 563, 705
Шкутка, Анатоль 891-894
Шліпс, Адольфс 603, 604, 860
Шміт, Тэкля 269, 497, 862
Шмітс, Юлій 312
Шпакоўскі, Пятро 148, 160, 338
Штраўбергс, Карліс 292, 322
Штэйнберг, П. 472
Штэрн, Курт 602
Шутовіч, Янка 854
Шушкевіч, Станіслаў 640
Шчорс, Ян 34, 148, 159, 160, 181, 183, 185, 195, 204-206, 212, 213, 221, 234, 235, 241, 285, 288, 311, 312, 321, 324, 335-353, 413, 446, 457, 460, 475-483, 491-496, 523, 572-580, 589, 602, 603, 620, 624, 627, 703, 707, 730-734, 776, 784
Шыдлоўская, Вольга 12
Шыла, Яўген 674
Шылініс, Антоніс 228, 319, 788
Шымковіч, Барыс 57, 62, 67, 71, 81

Э
Эберхард, Пётр 13, 762
Эйнберг, Герберт 296, 302
Эйсак, Віктар 598
Эльфенгрэн, Ю́р'ё 53
Энгельхард, Ойген фон 890, 891
Эрцумс, Карліс 562, 563

Ю
Юзафовіч, Надзея 518, 552, 523, 861, 867, 894
Юдзеніч, Мікалай 46-49, 52, 55, 57, 75
Юзэфская 851
Юр'еўскі, П. 861
Юркевіч, Мечыслаў 365,366, 504, 732
Юркевіч, Пелагея 342

Юркевіч, Юрась 11, 51
Юрэвіч, Браніслаў 296, 447,
Юрэвіч, Густаў (Юрэвічс, Густаўс) 562, 597,
Юхно, Зінаіда 598
Юшкевіч, Язэп 516, 518

Я

Ягайла 499
Ядвігін Ш. 573
Ядкевіч, Баляслаў 562
Якавюк, Сымон 677, 680-683, 686, 740
Якаўлева, Наталля 674
Якімовіч 258
Якубецкая (Антонава), Антаніна 172, 173, 221, 229, 338, 476, 540, 541, 866
Якубецкі, Андрэй 143, 151, 157, 171-175, 183, 190-196, 201, 202, 209, 219-221, 227, 229, 233, 238, 250, 251, 279, 283-288, 295, 301, 305, 309-316, 321, 323-325, 338, 339, 393, 418, 473-477, 540-542, 560-564, 571, 583-587, 613, 657, 658, 746, 859, 866, 884
Якубоўская, Юлія
Якубоўскі, Уладзімір 372, 373, 422
Якубоўскі, Уладзіслаў 422
Якубоўскі, Я. 454, 455, 457
Яленеўская, Феадосія 229
Яніцкі, Мікалай 39
Янковяк, Міраслаў 13, 14
Ярмак, Антось 247, 410
Яўдземс, Станіслаўс 233, 322
Яхімовіч, Я. 160, 759

Указальнік геаграфічных назваў

А
Абелі 40
Абрэнэ 108
Айвіекская воласць 106, 872
Айвіекстэ 106
Айзпутэ 103, 110, 870
Акнінская воласць 109, 871
Акніст 109
Альмборн 710
Алуксне 50, 58, 59, 117
Аляксандрова 814
Андрэпненская воласць 873
Аргентына 721
Арол 32
Асарская воласць 109, 871
Асарэ 109
Астроўскі павет 108
Асунская воласць 106, 107, 351, 504, 872
Асунь 106
Аўлеўская воласць 107, 503, 857, 872
Аўлея 106
Ашмянскі павет 883, 893

Б
Балвуская воласць 108
Бальбінова 143, 654, 788
Балтыйскае мора 42, 300
Балтыя 11, 14, 32, 41, 44, 49-55, 67, 74, 79-98, 324, 245, 399, 623, 627, 632
Бароўка 109
Бароўская воласць 108, 109, 158, 771, 871
Баўска 104, 110, 870, 873
Бебранская воласць 109, 871
Бебранэ 109
Беларуская Народная Рэспубліка (БНР) 11-18, 38-98, 130-146, 188, 189, 290-298, 308-318, 326, 361, 395, 396, 407, 418, 421, 457, 586, 609, 617, 636, 653-668, 677-689, 693-698, 833, 862, 883-889, 902, 909
Беларуская савецкая сацыялістычная рэспубліка (БССР) 18, 138, 228, 296, 306, 307, 324, 328, 349, 432-444, 453, 544, 472, 547, 613-689, 711, 738-741, 760, 778, 798, 863, 868, 890, 899, 904
Беларусь 6-16, 41-85, 101, 290-398, 433-470, 531, 532, 626, 640, 652-662, 684, 729, 734, 796, 889, 890, 891, 904, 906
Беласток 678
Беласточчына 35, 797
Бельск Падляскі 70, 73, 164, 403, 405
Бержгальская воласць 108
Берлін 64, 74, 83, 93, 227, 395. 464, 480, 620, 649, 656, 659-662, 819, 889-894, 910
Бернішкі 165
Бікерніекская воласць 872
Борненская воласць 108
Брадайжэ 165
Бразілія 695, 721

Браслаў 40, 878
Браслаўскі павет 145, 876-882
Брыгаўская воласць 105
Брыгі 105, 144
Букмуйжайская воласць 108, 873
Булдур 92
Быкаўская воласць 108
Бярозкі 813

В

Вайводаўская воласць 107, 108, 158, 873
Вайцюлева 339, 705
Валка 103, 110, 870
Вальмера 103, 110, 870
Варкава 107
Варкоўская воласць 107, 872
Варнавічы 783
Варшава 63, 64, 78, 93-95, 118, 136, 310, 395, 399, 444, 609, 630, 659, 661, 684, 762, 763, 792-798, 889
Вена 342
Венспілс 104, 110, 870
Відзэмэ 21, 26, 104, 110, 115, 116, 125-128, 857, 870, 874, 880
Вілейка 221
Вілейскі павет 876-880
Віленскае ваяводства 877
Віленшчына 23, 29, 30, 35, 63, 75, 84, 87, 89, 97, 111, 119, 672, 685, 782, 876-880
Вільня 8, 9, 14,М 30, 38, 40, 43-45, 51, 63, 77, 84, 95, 97, 101, 118, 142, 150, 156, 162, 168, 187, 191, 192, 205, 210, 215, 217, 218, 227, 245, 253, 280, 289, 293, 295, 308, 313, 342, 343, 362, 378, 39, 400, 413, 432, 433, 444, 460-468, 492, 532, 555, 573, 586, 609, 633, 635, 637, 644, 656, 657, 666-688, 721, 726, 740, 767, 804, 806, 811, 825, 827, 852, 854, 869, 878, 880, 884, 887, 888, 909, 910, 914, 915
Вілянская воласць 108
Віндаўскі раён 181
Віцебск 32, 137, 221, 630, 651
Віцебская губерня 24, 25, 33, 55, 60, 136, 267, 303. 607, 901
Віцебшчына 24, 32, 33, 46, 74, 119, 397, 469
Вішкі 106
Войні (Войны) 165
Вормія, возера 407
Выпенская воласць 107, 872
Выпес 107
Вышкаўская воласць 107, 502, 872
Вышкі 107, 201, 242
Вялікабрытанія 41, 49, 50-52
Вялікае Княства Літоўскае (ВКЛ) 22, 499, 582, 680

Г

Гарбачова 507
Гаравая (Гаравыя) 503, 504, 507, 780
Гарадзеншчына 87, 89, 782
Гарсенская воласць 109, 871
Гарсенэ 109
Гасціні 872
Геранімава 106
Геркі 165, 166
Горадня 142 307, 666, 678, 681, 773, 738-741, 888
Горацкі павет 78
Горкі 639
Граверская воласць 106
Граверы 106
Грыва 109, 117, 157, 871, 873
Грыбулі 165, 166

Д

Дагда 106
Дагдзенская воласць 106, 872
Данцыг 395, 400, 676, 855, 891
Даўгава 8
Даўгаўпілс 19, 27, 29, 32, 37,38, 47, 60-63, 70, 76, 104, 111, 115-118, 130, 141-145, 155, 157,168,172, 184-189, 196-202, 214-222, 227-245, 249-288, 295-302, 311-318, 332-358, 368, 369, 376, 378, 390, 395, 425, 427, 434, 448, 452, 457, 458, 464, 471-482, 490, 502, 545, 546, 559, 563, 573, 578, 580-597, 607, 621, 639, 643, 646, 657, 668, 676-687, 702-709, 714-724, 730-740, 745, 762, 764, 771, 775, 782, 797, 800, 808, 825, 832, 850, 857-859, 867, 871, 873
Даўгаўпілскі павет 19, 24-26, 77, 105-113, 126, 144, 154, 156, 163, 182-187, 209, 210, 216, 222, 237, 252, 295, 321, 327, 350, 375,

422, 474, 506, 508, 513, 546, 734, 748, 764, 770, 771, 781, 871
Даўгаўпілшчына 25, 26, 62, 78, 105, 107, 113, 138, 155, 157, 178, 182-187, 201, 210, 211, 222, 226, 235-239, 256263, 276, 293-299, 316, 321, 338-342, 348, 354, 371, 292, 403, 408, 421, 434, 449, 464, 474-484, 502-511, 524, 534, 546, 551, 565, 578, 597, 643, 670, 705, 770, 777, 781, 801, 805, 815, 819, 824, 825, 857, 873
Двіенценская воласць 109, 871
Двіетэ 109
Дзвіна 51, 690, 761, 766, 799
Дзвінск 19, 33, 37, 76, 77, 140, 142, 143, 174, 180, 188, 190-198, 248, 249, 269, 281, 286, 292, 297, 298, 305, 306, 308, 313, 371, 398, 474, 505, 533, 551, 565, 569, 574, 581, 637, 656, 672-674, 730, 738, 775, 793, 781, 833, 859, 884
Дзвіншчына 102, 189, 294, 296, 308, 393
Дземанская воласць 109, 871, 875
Дземанэ 109
Дзірванішкі 505, 507
Дзісненскі павет 43, 876-880
Доўгія Кушняры 166, 169
Дразды 780
Дрыса 27, 78, 900
Дрысенскі павет 24, 38, 39, 304
Дылевічы 784

Е

Екабпілс 104, 111, 117, 870, 873
Елгава 104, 111, 117, 870, 873

Ё

Ёніны 748

Ж

Жэнева 433, 721

З

Заграб 399
Залессе, вёска 403, 422, 748
Залессе, маёнтак 204, 270
Залеская воласць 333
Зальмуйжская воласць 105
Заользінская Сілезія 767
Зарасай 584
Зарнішкі 778, 779
Заходнеўкраінская народная рэспубліка (ЗУНР) 94
Заходняя Беларусь 17, 328, 407, 432-437, 532, 552, 581, 615, 622, 633, 637, 638, 661, 671, 672, 682-691, 744, 828, 882, 883, 899, 900
Земгалія 21, 26, 30, 102-116, 125-1227, 548, 692, 707, 716, 720, 749-757, 764, 765, 870, 874, 880
Зілупе 144, 179, 233, 242, 270, 274, 362, 365, 403-407, 434, 837, 872, 873
Звіргздэнская (Звіргздзецкая) воласць 426
Звіргздэнэ 106
Звірдзеншчына 393
ЗША (Злучаныя Штаты Амерыкі) 16, 50, 54, 207, 217, 433, 435, 475, 653, 655, 663, 675-677, 721, 884, 904
Зяленчыкі 306
Зукулішкі 165

І

Ізабэлінская воласць 107, 144, 165, 387, 710, 777
Ізвалта 106
Ізвалцкая воласць 106, 107
Ізборск 56
Ілукшта 29, 104, 109, 111, 117, 870, 871, 873
Ілукштанскі павет 30, 31, 32, 39, 40, 77, 108, 109, 127, 131, 209, 218, 224, 231, 233, 278, 279, 297-306, 380, 554, 747, 762, 785, 798, 858, 871, 882, 905
Ілукшчына 29-32, 102, 112-119, 130, 145, 157, 158, 179, 260, 293, 304, 305, 317, 354, 375-379, 388, 403, 424, 443, 448, 455, 482, 484, 502, 551, 710, 727, 731, 747-750, 762-771, 782-786, 792-797, 819, 828, 857, 864, 867, 871
Індра 785
Індраўская воласць 350
Індрыца 774, 780
Істэрская (Істраўская) воласць 25, 78, 102, 105, 106, 113, 139, 154, 164, 226, 333, 394, 489, 569, 811, 823, 824

Інфлянты (Польскія Інфлянты) 23, 768, 798
Італія 208

К
Калкунская воласць 109, 871
Калкуны 40, 109, 771, 871
Калуп 106
Калупская воласць 106, 872
Канада 347, 721
Капінская воласць 106, 107, 293, 502, 872
Каплава 109, 374, 705, 709
Каплаўская воласць 109, 158, 351, 771, 783, 871
Карсава, станцыя 25
Карсава,горад 104, 105, 872
Каўнацкая воласць 107, 108, 873
Кесь 103, 110, 870
Кёнігсберг 400, 890
Кіеў 531, 563
Кісялеўцы 814
Ковенская губерня 159, 197
Козіды 165
Корсаўка 62, 105, 654
Корсаўская воласць 872
Коўна 51, 63, 73, 96, 97, 191, 192, 227, 296, 433, 442, 464, 616, 657, 668, 677-682, 715, 740, 893
Кракаў 794
Краслава 19, 104, 106, 115, 117, 141, 144, 146, 155, 169, 176, 220, 233-241, 276, 277, 380, 383, 434, 535, 584, 679, 705, 735, 736, 764, 786, 789, 832, 872, 873
Краслаўка 19, 155, 165, 166, 351, 357, 375, 736, 859
Краслаўская воласць 25, 106, 107, 165, 770, 872
Крустпілс 104, 117, 872, 873
Крывічы 878
Крыжсборгская воласць 872
Кулдыга 103, 110, 870
Курляндская губерня 30, 31
Курляндыя 21, 26, 103-105, 110, 115, 116, 120, 125-128, 430, 654, 692, 694, 857, 870-874, 880
Курцумская воласць 109, 771, 871

Л
Лайні 504
Ландскаронская воласць 25, 106, 403, 502, 787, 873
Ландскрон 24
Ландскаронская парафія 787
Ласенская воласць 109, 871
Латвійская Рэспубліка 7, 30, 63, 77, 99, 100, 123, 129-138, 147, 180, 340 409, 537, 681, 687-693, 759, 842, 905
Латвія 8-21, 36, 43, 46, 57, 62, 63, 78, 83, 91, 92, 99, 122, 127-138, 147, 280, 302-306, 314, 329, 346, 454, 462, 615, 629, 652, 658, 665, 683, 763, 768, 796, 843, 844, 864, 899
Латгалія 13-63, 76-78, 101119, 125-167, 183189, 201, 207, 215, 216, 230, 233, 248, 255, 262, 263, 278, 291, 293, 298-320, 326, 328, 338, 343-357, 365-371, 379, 385-398, 413-434, 441-449, 462, 466-477, 490, 493, 498, 515, 519, 524, 548, 565, 569, 574, 584, 590, 591, 605, 606, 613, 616, 622, 624, 631, 638, 654-674, 685, 692-721, 727-731, 738-770, 782-804, 815, 820, 826-841, 847-874, 887, 898, 903-906
Лельборн 749
Ленінград 118
Лібава 19, 76, 116
Лівенгоф 106, 872
Лівенская воласць 107, 872
Лівонскі ордэн 22
Ліепайшчына 869
Ліепая 19, 32, 45, 54, 68-73, 81-86, 103, 110, 117, 332, 333, 360, 482, 646, 870
Ліксна 107
Лікснeнская воласць 872
Ліўчаны 155
Літва 15, 16, 33, 42-47, 63, 8593-98, 132, 189, 217, 219, 227, 228, 244, 298, 303-312, 335, 391, 399, 413, 432, 433, 443, 444, 464, 470, 584, 615, 621, 629, 637, 647, 653, 654, 661-667, 678-683, 688, 724, 798, 843, 867, 868, 875, 876, 884, 888
Ліфляндыя 26, 103, 105, 116, 548
Лондан 41, 48, 49, 73, 399
Лонькі 165
Лудза 19, 27, 29, 37, 62, 104, 105, 111-117, 118, 144-157, 168-176, 199, 218, 220, 227-

246, 263-279, 295, 301, 318, 332, 338-343, 354-367, 384, 389, 405, 406, 421, 425, 434, 448, 456, 458, 462,464, 471, 474, 502, 509, 510, 527, 535, 545, 546, 573, 629, 631, 679, 697, 705, 709, 710, 724, 764, 800, 806-812, 820, 832, 867, 869, 871, 872, 873
Лудзенскі павет 19, 24-27, 43, 61, 77, 78, 100, 105-113, 126, 144, 154, 156, 164-169, 182, 189, 199, 209, 216, 220, 230, 237, 239, 246, 265, 270, 278, 301, 350, 404, 422, 487, 489, 503, 506-511, 535, 554, 558, 575, 670, 700, 709, 727, 748, 764-773, 783, 799, 801-825, 852, 872, 874
Лудзеншчына 25, 26, 62, 78, 105-113, 138, 154-157, 168, 178-189, 201, 216, 222, 226, 231-238, 256-267, 294-296, 321, 333, 338, 351, 354, 391, 393, 403, 415, 449, 464, 474-489, 503-508, 524, 546, 551, 566, 578, 670, 734, 770, 781, 782, 801, 811-829, 833, 838, 856, 857, 873
Лукштані 780
Ляйнікі 780
Ляксы 165
Ляльнікі 507
Ляўдарская воласць 164, 333
Ляўдарскі прыход 829
Ляўдары 144, 361, 502, 546
Люцын 19, 37, 76, 142, 144, 188, 269, 281, 292, 391, 422, 510, 511, 569, 698, 793, 807
Люцынскі павет 155, 214, 223, 244, 285, 298, 304-306, 426, 484, 489, 569, 575, 668, 776, 816-823, 841, 908
Люцыншчына 243, 308

М

Магілёў 630
Магілёўская губерня 78
Мадона 103, 110, 870
Макашанская воласць 873
Максімаўская воласць 163, 211, 224
Маладзечанскі павет 876, 880
Малая Індрыца (гл. Індрыца) 774, 780, 791
Малінаўская воласць 107, 502, 813, 872
Марцішы 333
Масква 59, 63, 75, 89-94, 116, 136, 138, 307399, 626, 627, 661, 666, 825, 888
Менск 9, 39, 47, 48, 59, 63-65, 84, 91-93, 142, 294, 296, 307-316, 327, 343, 435, 438-444, 460, 472, 613-653, 659-667, 676, 689, 744, 852, 888, 904
Менская губерня 136, 607
Мердзене 105, 872
Мердзенская воласць 105, 106, 872
Міхайлаўская воласць 105, 154, 709, 872
Міхалова 705
Мэжвіды 107
Мэжвідская воласць 107, 872

Н

Наваградскае ваяводства 876, 877, 881
Нарвегія 50
Наўенская воласць 107, 872
Наўтрэнская воласць 105, 872
Невель 70
Невельшчына 267, 437, 629
Нірдзенская воласць 105, 106, 873
Нірза 105
Нова-Латгалія 104, 111, 871
Нова-Латгальскі павет 105-113, 126, 874
Новы Грунвальд, маёнтак 40
Новы Мільграбен 363
Нямеччына (Германія) 46, 74, 75, 99, 302, 801, 889-904, 915
Няўляны 782

П

Падлесіца165
Пакумін 426
Парыж 41, 42, 48, 54, 221, 224, 395, 889
Парышкі 165
Пасіенская воласць 25, 102, 105, 167, 209, 241, 387502, 503, 567, 772-785, 824, 873
Пасіенэ 24, 105, 106, 272, 368, 777
Пастаўскі павет 876, 882
Паўночная Амерыка 721
Петраград (Пецярбург) 47, 52, 59, 116, 170
Прыдруйская воласць 25, 102-107, 113, 143, 144, 154, 163, 186, 189, 210, 211, 306, 351, 702, 710, 715, 748, 806, 814, 873
Прыдруйшчына 224, 327, 387, 393, 447, 482, 591, 716,
Прыдруя 107, 242, 367, 403, 686, 828
Пілсканская воласць 109

Пілскалнэ 109
Полацк 43, 47, 57, 59, 531
Полацкае ваяводства 387
Полацкае княства 22, 23, 304, 586
Полацкая губерня 136
Полаччына 23, 33, 397, 738
Польшча 15-19, 30, 44-66, 74, 87-96, 130-132, 139, 140, 224-228, 298, 306, 315, 317, 324, 342, 349, 413, 431-433, 443, 449, 453, 456, 462, 499, 531, 615, 620-627, 633, 647, 653, 658, 662-688, 724, 732, 761-768, 775, 776, 792-801, 828, 843, 862, 868, 875, 876, 881-892, 899, 904-908
Прага 18, 313, 317, 395, 433, 434, 444, 464, 626, 635, 657, 659, 666, 667, 669-679, 740
Продская воласць 109, 871
Прэждэнскі замак 394
Прэлі 107, 872
Прэльская воласць 107, 872
Пскоўская губерня 108
Пскоўшчына 44, 55
Пупікі 705
Пустын (Пустынь) 159, 357, 374, 377, 403, 705, 711, 717, 748, 789
Пустынская воласць 25, 38, 39, 100, 105, 107, 144, 154, 164, 186, 189, 210, 216, 217, 224, 305, 351, 770, 857, 873
Пустынская парафія 212
Пустыншчына 242, 327, 393, 407, 482, 591, 789
Путынава 407
Пылда 105
Пылдзенская воласць 709, 809, 810, 873, 908

Р

Рабежніцкая воласць 107
Рагоўка 105
Разенмуйжская воласць 107
Ракішкі 40
Расійская Імперыя 23, 31, 36, 42, 118, 123, 345, 826
Расія 15, 16, 23, 30, 39, 41-51, 60, 63, 75, 87, 89, 92-96, 120, 132, 212, 223, 299, 317, 400, 434, 531, 586, 613, 607, 645, 755, 796-801, 812, 815, 839, 877
Расійская савецкая федэратыўная сацыялістычная рэспубліка (РСФСР) 90-99, 130, 437, 650
Раўданская воласць 109, 871
Рудні 226
Рэжыкнэ 19, 27, 29, 76, 104, 111, 117, 141-146, 158, 168, 434, 734, 771, 800, 871
Рэжыца 19, 24-26, 76, 142, 787, 803824, 837, 851
Рэжыцкі павет 24-27, 62, 105-113, 126, 154-1158, 209, 218, 278, 297, 301-306, 764, 768, 801, 804, 874
Рэжыччына 25, 105-108, 114, 138, 144, 155-159, 179, 221, 354, 403, 404, 424, 484, 502, 770, 801, 819, 857, 873
Рэч Паспалітая 23
Розенэке 272
Ромна 32
Рубені 109
Рубенская воласць 871
Ругайская воласць 108
Рудзянская воласць 872
Рудзяны 107
Ружынская воласць 107
Румынія 44
Рунданская воласць 105, 106, 113, 699, 700, 709, 771, 787, 788, 790
Рунданы 105, 144, 155, 357, 362, 365, 605, 811, 873
Рускія Гарбуны 810
Рыга 9, 15, 16, 17, 32, 36-160, 166, 180-187, 195, 196, 207, 220, 236, 241-249, 258, 261, 272, 287, 292, 300, 308-312, 318, 323, 327, 331, 332-371, 378, 379, 398, 401-419, 425, 428, 432, 434, 442-451, 457-471, 477, 479, 484, 493, 494, 501, 502, 506, 507, 515-525, 530, 535, 538, 544, 545, 546, 591, 605, 606, 616, 624, 628, 631, 638, 659, 661, 670, 679, 682, 686, 692, 714, 729, 751, 762, 788, 798, 800, 864, 865, 869, 870, 873, 885, 896-907
Рыжскі павет 112-114
Рым 207

С

Савейкаўская воласць 504, 533
Савейкі 507
Савецкі Саюз 10, 138, 435, 648

Сакстыгальская воласць 108
Саліена 108, 109
Саліенская воласць 108, 109, 710
Салуёнская воласць 108
Саркандаўгава 121, 151, 335, 357, 359, 367, 388, 408, 491, 516, 521, 601, 854
Свентэ (Свенты) 109, 375, 380
Свенцская воласць 109, 871
Свянцянскі павет 876, 877, 880
Свянцяны 383, 878
Себежскі павет 24, 304
Себежчына 221, 437, 443, 629
Сілена 109
Сіленская воласць 108, 109, 158, 719, 771, 871
Скайсты 107
Скайсценская воласць 107, 351, 502, 503, 578, 748, 781, 857, 872
Скапішкі 40
Скрудаліена (Скрудаліна) 109, 157, 375, 705, 828
Скрундалінская воласць 109, 871
Слабадская парафія 166
Смаленская вобласць 437
Смаленская губерня 70
Стальты 504
Сталяты 774
Стараслабодская воласць 25, 78, 102, 105, 106, 113, 139, 154, 164, 226, 333, 394, 489, 569, 811, 823, 824
Старая Слабада 106, 144, 179, 216, 332, 351, 357, 393, 575, 812
Стрэмкі 813
Стэленская воласць 109
Субата (Субатэ) 109, 871, 873
Сусейская воласць 109, 871
Сусея 109
Сусэкле 40

Т
Талін 17, 41, 45-54, 68, 89, 307, 345, 642-652, 863, 899, 906
Талоеўцы 705
Талсі (Талсэн) 104, 110, 870
Тамерсфорс 53
Тартакі 374, 705, 709, 748
Толкаўская воласць 105
Торнакалнс 151
Тукумс 104, 110, 870

У
Ужвалдская воласць 872
Украіна 42, 44, 60, 63, 93
Украінская народная рэспубліка (УНР) 65, 93, 94
Унгурмуйжа 107
Унгурмуйжская воласць 107
Усходняя Прусія 400

Ф
Фінляндыя 44, 45, 49-54, 59, 98
Францыя 41, 50, 464, 801
Фрыдрыхштацкі павет 24

Х
Хельсінкі 52, 53
Хршчова 109

Ц
Цуцуркі 404
Цыбла 105
Цыблаўская воласць 105, 106, 872

Ч
Чорнае мора 42, 339
Чыкага 207, 307, 433, 438, 439, 464, 633, 666, 675-677, 721
Чэхаславакія 18, 324, 335, 342, 433, 356, 557, 615, 653, 668-675, 685, 801, 904


Ш
Швецыя 50, 54
Шкяўне 106
Шкяўненская воласць 25, 106, 403, 502, 787, 873
Шкінцава 426
Шушкава 404, 406, 776, 777, 865
Шушкаўская воласць 333
Шушкі 365, 403
Шылава 503
Шэдарэ 109


Э
Эверсмуйжская воласць 105, 106, 169, 206
Эдвардаслава 426
Эстонія 16, 17, 41-45, 53-59, 66, 74, 75, 87, 93, 98, 129, 361, 398, 684, 875, 876

Ю
Юзафова 107
Юхнікі 780

Я
Янавольская воласць 105, 154, 709, 815
Японія 50
Ясмуйжа 106, 872
Ясмуйжская воласць 106, 872









Wydawnictwa Uniwersytetu Warszawskiego
ul. Smyczkowa 5/7, 02-678 Warszawa
tel. 22 55 31 333
www.wuw.pl

Праф. др габ. Ежы Гжыбоўскі, супрацоўнік Інстытута міжкультурных даследаванняў цэнтральнай і ўсходняй Еўропы Факультэта прыкладной лінгвістыкі Варшаўскага ўніверсітэта. Спецыялізуецца ў вайсковай, палітычнай і рэлігійнай гісторыі рэгіёну ў XX ст. Яго навуковы даробак налічвае звыш 280 навуковых публікацый, з якіх 12 манаграфій ў Польшчы і Беларусі.

Дадзеная манаграфія прысвечана гісторыі беларускай меншасці ў Латвійскай Рэспубліцы ў 1918–1940 гг. Даследаванне падрыхтавана на падставе беларускіх, латвійскіх, літоўскіх, эстонскіх, амерыканскіх, чэшскіх, і расійскіх крыніц. У кнізе асвятляецца становішча беларусаў Латвіі ад моманту ўзнікнення незалежнай латвійскай дзяржавы да яе акупацыі савецкім агрэсарам. Аўтар ахарактарызаваў колькасны і сацыяльны склад латвійскіх беларусаў, іх культурна-асветную і грамадска-палітычную працу, узаемаадносіны з латвійскай дзяржавай і прадстаўнікамі іншых нацыянальных меншасцей, а таксама сувязь з метраполіяй і суайчыннікамі па-за межамі Латвіі.

www.wuw.pl